
BEKOPS.
93
B-43



АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ
БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

П. У. БРОЎКА (галоўны рэдактар), Р. І. АРЫКА, К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва), М. А. БАРЫСЕВІЧ, І. Д. КАЗЕКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. К. КРАСІН, К. І. ЛУКАШОЎ, А. В. ЛЫКАЎ, Ф. С. МАРЦІНКЕВІЧ, А. С. МАХНАЧ, М. Дз. НЕСЦЯРОВІЧ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (адказны сакратар), П. Дз. ПУЗІКАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), М. Я. САЎЧАНКА, С. Г. СКАРАПАНАЎ, Я. І. СКУРКО (Максім Танк), Ф. І. ФЁДАРАЎ, К. І. ШАБУНЯ, Р. Р. ШЫРМА, М. Ф. ЯРМОЛЕНКА, М. П. ЯРУГІН.

ТОМ IV

ГРАФІКА—ЗУЙКА

МІНСК. 1971



РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ

П. У. БРОЎКА (старшыня савета), Л. С. АБЭЦЭДАРСКІ, В. К. БАНДАРЧЫК, Ф. В. БАРАВІК, В. В. БАРЫСЕНКА, Г. І. БАРЫШАЎ, А. І. БОЛСУН, С. Х. БУДЫКА, І. А. БУЛЫГІН, К. П. БУСЛАЎ, Г. К. ГАРАНСКІ, Д. М. ГОЛУБ, В. А. ГРАМЫКА, Г. Х. ДАЎГЯЛА, В. А. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ, М. У. ДЭМБІНСКІ, М. А. ЕЛЬЯШЭВІЧ, В. Р. ЗАЎРЫЕЎ, В. У. ІВАШЫН, І. М. ІГНАЦЕНКА, В. М. КАВАЛГІН, Г. Ц. КАВАЛЕЎСКІ, Р. К. КАЖЭЎНІКАВА, М. С. КАЗЛОЎ, Н. В. КАМЕНСКАЯ, Р. В. КАНАВАЛАЎ, М. Ф. КАПІЧ, У. А. КАРОЛЬ, У. І. КРЫЛОЎ, Г. М. ЛІЎШЫЦ, М. П. ЛОБАН, І. М. ЛУШЧЫЦКІ, С. М. МАЛІНІН, В. С. МАЎРЫШЧАЎ, Дз. М. МАЦЯС, Б. П. МІЦКЕВІЧ, М. Р. МУРАШКА, У. І. НЯФЕД, Ф. М. НЯЧАЙ, М. П. ПАЛЕТЫКА, М. І. ПАХОМАЎ, Э. М. ПОЗНЯК, Дз. П. РАДЗЮК, П. Ф. РАКІЦКІ, М. Т. РАМАНОЎСКІ, М. А. САВІЦКІ, Э. М. САВІЦКІ, А. К. САНІНКАЎ, У. М. СІКОРСКІ, І. А. СКРЫГАН, Р. Л. СТАРОБІНЕЦ, М. Р. СУДНІК, Дз. А. СУПРУНЕНКА, В. І. СЦЯПАНАЎ, У. М. ТРАЦЦЯКОЎ, І. І. ТРУХАН, С. А. УМРЭЙКА, В. В. УРУСАЎ, І. П. ХАЎРАТОВІЧ, Г. І. ЦІТОВІЧ, Р. С. ЧАБАТАРОЎ, У. А. ЧАНТУРЫЯ, М. Я. ШКЛЯР, В. А. ШКУРКО, Л. М. ШНЕЕРСОН, В. І. ШЭМПЕЛЬ, Э. А. ЮШКЕВІЧ, В. І. ЯЛАТАЎ, П. І. ЯШЧАРЫЦЫН.

ТЭРМІНАЛАГІЧНАЯ КАМІСІЯ

К. К. АТРАХОВІЧ (Кандрат Крапіва) — старшыня камісіі, М. Р. СУДНІК — намеснік старшыні камісіі; члены камісіі: М. В. БІРЫЛА, П. У. БРОЎКА, М. М. ГАНЧАРЫК, Г. І. ГАРЭЦКІ, І. Д. КАЗЕКА, А. А. КАРАТАЙ (Максім Лужанін), Ц. В. КРЫСЬКО (Васіль Вітка), М. П. ЛОБАН, В. І. РАБКЕВІЧ, І. І. СЕМЯЖОНАЎ (Язэп Семяжон), І. А. СКРЫГАН, Ф. І. ФЁДАРАЎ, Л. М. ШАКУН, Ф. М. ЯНКОЎСКІ.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ 4-га ТОМА

М. Г. АГУРЦОЎ, І. П. АНТОНАЎ, П. Ц. АСТАШЭНКАЎ (Масква), С. Р. АЎСЯНІКАЎ, Ю. С. БАГДАНАЎ, У. А. БЕЛЫ (Гомель), А. А. БІРАЛА, В. В. БОЙКА, Р. В. БУЛАЦКІ, Дз. П. БЯЛЯЦКІ, Н. В. ВАТАЦЫ, А. С. ВЕЧАР, В. В. ГАЎРЫЛЮК, Ф. Дз. ГАХАЎ, И. С. ГІЛЕВІЧ, Дз. П. ГОРСКІ (Масква), А. Е. ГУРЫНОВІЧ, В. С. ДАВЫДАВА, М. П. ДАРАФЕЕНКА, А. В. ДУЛАЎ, М. П. ЕРПЫЛЕЎ (Масква), А. І. ЗАЛЕСКІ, І. С. КАВАЛЕЎ, Л. В. КАЗЛОЎСКАЯ, У. А. КАЛЕСНІК (Брэст), У. С. КАМАРОЎ, Я. Р. КАНАВАЛАЎ, Г. В. КІСЯЛЕЎ (Вільнюс), У. М. КОНАН, А. В. КРАСІНСКІ, М. І. КРАСОЎСКІ, В. Р. КРАСТОЎСКІ, М. Р. КРУЦЬКО, В. Я. КРЫШЧАНОВІЧ, К. А. КУЛІНКОВІЧ, І. І. КУПЧЫНАЎ (Гомель), І. І. ЛЕАНОВІЧ, П. П. ЛІПІЛА, А. А. ЛОЙКА, В. Дз. МАРОЗАЎ, А. І. МЕТЧАНКА (Масква), В. Ф. МЯДЗВЕДЗЕЎ, І. Я. НАВУМЕНКА, Г. Л. НАПРЭЕЎ, І. М. ПАНЬШЫНА, П. Ф. ПРАТАСЕНЯ, Р. М. САМАРЫН (Масква), В. І. СЕМЯНКОЎ, Дз. Ф. СІДАРЭНКА, Н. А. СНІЦАРАВА, Г. Р. СЯНКЕВІЧ, Г. К. ТАТУР, М. Я. ЦІКОЦКІ, Г. В. ШТЫХАЎ, С. А. ШЧАРБАКОЎ, В. П. ЯКУШКА, С. Я. ЯНЧАНКА.

Центральная научная БИБЛИОТЕКА Академии наук Беларуси
416811

Г

Фінікійская | Старажытнагрэчаская | Візантыйская | Глаголіца балгарская 11 ст. | Уставы 11 ст. | Царкоўнаславянская 13–16 ст. | Царкоўнаславянская 16–18 ст. | Скорапіс 15 ст. | Беларускі скорапіс 16 ст. | Паўуставы канца 17 ст. | Грамадзянскае пач. 18 ст. | Лацінская

ГРАФІКА (ад грэч. graphikós намаляваны), від выяўленчага мастацтва, які аб'ядноўвае *малюнак* (як самастойную галіну творчасці) і заснаваныя на мастацтве малюнка друкаваныя мастацкія выявы *(гравюра, літаграфія)*.

Творы графікі робяцца звычайна на паперы. Асн. выразныя сродкі Г.— контурная лінія, штрых, пляма, а таксама белы ці каляровы фон ліста, на які наносіцца выява. Колер уводзіцца ў твор Г. не заўсёды і не так шырока, як у жывапісе. На мяжы жывапісу і Г. стаяць акварэль, гуаш, пастэль. Дзякуючы лаканізму маст. мовы, магчымасці раскрыць тэму ў шэрагу паслядоўных выяў, зручнасці ўзнаўлення вял. тыражамі, Г. шырока выкарыстоўваецца ў галіне масавай агітацыі і прапаганды, для стварэння *плакатаў, карыкатур, ілюстрацый, лубкоў* і інш., мае выключна шырокія магчымасці ў справе ідэйна-палітычнага і мастацкага выхавання мас.

Г. падзяляецца на станковую (станковы малюнак, эстамп), кніжную і часопісна-газетную (ілюстрацыя, дэкар. афармленне, шрыфты), прыкладную (маркі, афішы, этыкеткі і інш.). Сродкамі Г. звычайна выконваюцца падрыхтоўчыя работы да твораў іншых відаў мастацтва, архітэктурная Г., напр., фіксуе арх. замыслы на розных стадыях праектавання.

З эпохі Адраджэння Г. належала важная роля ў культурным і паліт. жыцці народаў. У галіне Г. працавалі многія выдатныя мастакі (Мікеланджэла, А. Дзюрэр, Рэмбрант, Хакусай, А. Дам'е, Ф. Маземэль, П. Пікасо, К. Кольвіц, В. Сіроў, У. Фаворскі і інш.).

Бел. Г. бярэ пачатак у кніжнай мініяцюры («Мсціжскае евангелле», «Аршанскае евангелле», абодва 14 ст.; «Шарашоўскае евангелле», 15 ст.). Яе росквіт у 16 ст. звязаны з паяўленнем кнігадрукавання (кслаграфіі выданняў бел. першадрукара Ф. Скарыны, П. Мсціслаўца, І. Фёдарава). У 1-й пал. 17 ст. цэнтрам беларускага кнігадрукавання становіцца Куцеінскі манастыр каля Оршы. Уадым бел. Г. на мяжы 17—18 ст. звязаны з творчасцю магілёўскіх майстроў гравюры на медзі і дрэве М. і В. Вашчанкаў, ксілографа Ф. Ангілейкі. Вядома гравюра на дрэве «Багародзіца з целам Хрыста на каленях», створаная ў 40-я г. 18 ст. ў Супраслі бел. гравёрам П. Камаром. Станковая Г. развілася ў 2-й пал. 18 ст. (медзярыты а партрэтамі кн. Радзівілаў работы Гершкі Ляйбовіча; нясвіжскія тэатр. гравюры М. Жукоўскага), літаграфія і малюнак пашырыліся ў 1-й пал. 19 ст. (сацыяльна завостраныя малюнкі Ю. Азямблоўскага, ілюстрацыі К. Альхімовіча, гістар. кампазіцыі і бытавыя замалёўкі М. Э. Андрыёлі, Я. Дамеля, А. Каменскага, І. Хруцкага, карыкатуры А. Бартэльса і інш.). Узмацненне самадзяржаўнага гнёту (асабліва пасля разгрому паўстання 1863) прывяло да заняпаду выяўл. мастацтва Беларусі, у т. л. Г. Часткова яе пашырэнне ў пач. 20 ст. звязана з мастакамі — выпускнікамі Пецярбургскай АМ (С. Богуш-Сестранцэвіч). У перадрэвалюц. перыяд паяўляецца паліт. карыкатура (К. Каганец). Пасля перамогі Кастр. рэвалюцыі пачаўся росквіт бел. сав. Г. Мерапрыемствы Сав. улады — выпуск газет і часопісаў, стварэнне Дзярж. выдавецтва БССР, наладжванне перыядычных маст. выставак (у т. л. ў 1934 выстаўкі кніжнай графікі ў Мінску) і адкрыццё аддзялення графікі (1930) пры Віцебскім маст. тэхнікуме — стварылі базу для развіцця ўсіх відаў бел. Г., у т. л. плаката. Асн. тэмамі графікі становіцца гісторыя барацьбы бел. народа за свабоду і незалежнасць, падзеі Кастр. рэв., гераічная праца. Сярод графікаў 20—30-х г.— Л. Астаповіч, А. Бразер, В. Волкаў, З. Гарбавец, П. Гуткоўскі, В. Дваракоўскі, Г. Змудзінскі, Л. Лейтман, М. Малевіч, Б. Малкін, С. Юдовін і інш. У Вял. Айч. вайну бел. графікі стварылі своеасаблівы летапіс гераічнай барацьбы народа. Асабліва месца занялі малюнкі мастакоў-партызанаў М. Гуціева, С. Раманава, У. Сухаверхава. З паліт. карыкатурай у агітплакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» і час. «Партызанская дубінка» выступалі І. Ахрэмчык, В. Букаты, П. Гаўрыленка, Я. Зайцаў, Дз. Красільнікаў, Я. Красоўскі, М. Філіповіч і інш. Пасляваенная бел. Г., і асабліва графіка 2-й пал. 50—60-х г., вызначаецца разнастайнасцю тэм, жанраў, тэхнікі,

творчых тэндэнцый. Сярод майстроў эстампа і кніжнай ілюстрацыі — Л. Асецкі, У. і М. Басалыгі, С. Герус, А. Дзямарын, Б. Забораў, А. Кашкурэвіч, А. Лось, Г. і Н. Паплаўскія, А. Паслядовіч, В. Шаранговіч і інш. Іл. гл. на ўкл. да гэтага арт. і да арт. *Афорт, Гравюра, Ілюстрацыя, Карыкатура, Кніга, Літаграфія, Малюнак.*

Літ.: Рудометов М. Д. Опыт систематического курса по графическим искусствам, т. 1, СПб., 1898; Варшавский Л. Р. История графических искусств народов СССР, М., 1960; 50 лет советского искусства. Графика. [Альбом], М., 1966; Очерки по истории изобразительного искусства Белоруссии, М.—Л., 1940; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960; Бескин О. Живопись и графика Белорусской ССР, «Искусство», 1940, № 6; Генин Д. Изобразительное искусство Белорусской ССР. [Живопись. Графика], «Творчество», 1940, № 7; Bock E. Geschichte der graphischen Kunst von ihren Anfängen bis zur Gegenwart, Berlin, 1930.

П. М. Герасімовіч (беларуская графіка). Мінск.

ГРАФІТ (ням. Graphit, ад грэч. gráphō пішу), самародны мінерал, паліморфная мадыфікацыя вугляроду (С). Разнавіднасці: графіты (скрытакрышталічны), шунгіт (аморфны). Крышталізуецца ў гексаганальнай сістэме. Крышталі — шасцівугольныя пласцінкі, таблічкі, агрэгаты тонкалускаватыя, зрэдку радыяльна-прамяністыя, валакністыя. Колер ад жалеза-чорнага да сталёва-шэрага. Бляск моцны металападобны. Цв. 1, тлусты на вобмацак, шчыльн. 2090—2230 *кг/м*^{3}. Мае высокую цепла- і электраправоднасць, хім. інертнасць, вогнетрываласць і пластычнасць.

Трапляецца ў метамарфічных і магматычных горных пародах, у пегматытах. Радовішчы ў СССР (Усх. Сібір, Украіна), Чэхаславакіі, ЗША, Малагасійскай Рэспубліцы (Мадагаскар). Ужываецца для вырабу графітавых тыгляў, электродаў, у ліцейнай справе, вытворчасці алоўкаў, змазак, у фарбавай і атамнай прамысловасці. Г. атрымліваюць таксама штучна пры награванні антрацыту да 2200—2500 °С у эл. печы без доступу паветра.

ГРАФІЦІ (італьян. graffiti мн. лік ад graffito літар. надрапаны), стараж. надпісы, зробленыя вострымі прадметамі на сценках будынкаў, гліняных і металічных рэчах. Пашыраны ў Стараж. Грэцыі, Рыме, Кіеўскай Русі. Пры раскопках на Беларусі знойдзены прасліцы з надпісамі: «Бабино пряслень» (Віцебск), «къняжинъ» і «ника» (Друцк), «Настасино праслен» (Пінск), прасліцы і камень з татарскімі лічбамі, напісанымі кірыліцай (Полацк); карчагі і амфары з надпісамі: «...ополчо вино» (Пінск), «олъкъсн» (Навагрудак) і інш. Бытавыя рэчы і посуд з старажытнарус. літарамі знойдзены пры раскопках амаль усіх раннефеад. бел. гарадоў. Цікавы надпіс 12 ст. выяўлены на сцяне Кіеўскай Сафіі: «Воинегъ писалъ Журяговичъ полоцанин». Гэта першае пякняскае імя палачаніна, якое дайшло да нас. Блізкія да Г. па выкананні *берасцяныя граматы*. Г. маюць вялікае значэнне для вывучэння мовы, пісьменнасці, рэлігіі, побыту стараж. і сярэдневяковых грамадстваў.

Літ.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966, с. 227—236; Лысенко П. Ф. Шиферное пряслице с надписью из Пинска, «Советская археология», 1966, № 3; Малевская М. В. Амфора с надписью из Новогрудка, там жа, 1962, № 4.

Л. Д. Побаль. Мінск.

ГРАФІЧНЫЯ МЕТАДЫ У КІРАВАННІ ВЫТВОРЧАСЦЮ, адлюстраванне арганізацыйна-вытворчых працэсаў з дапамогай графікаў, якія забяспечваюць наглядnасць, аблягчаюць успрыманне інфармацыі, павышаюць эфект. планавання, уліку і кантролю.

Графічныя метады заснаваны на сінаптычнасці графічнага запісу: многія лічбы і факты, якія характарызуюць паўныя сувязі, прапорцыі, структурныя ўзаемаадносіны арганіз.-вытв. працэсаў, выражаюцца ўмоўнымі абазначэннямі — лініямі, сімваламі, надпісамі. З дапамогай графікаў можна маделяваць працэс кіравання, вызначаць вытворчыя ўзаемасувязі, разліковыя паказчыкі і нарматывы, групаваць і класіфікаваць гасп. аперацыі, ажыццяўляць кантроль і ўлік і г. д. У кіраванні вытворчасцю ўжываюцца наст. графікі: ілюстрацыйныя (для найб. выразнага паказу пастаўленай мэты); інфармацыйныя (для поўнага і наглядnага адлюстравання вытв. працэсу); аператыўныя (даюць неабходную інфармацыю для прыняцця аператыўных рашэнняў); аналітычныя (для вывучэння і прагназавання вытв. сітуацый); разліковыя (даюць паказчыкі, залежныя ад многіх умоў). Паводле аб'ектаў графіравання і формаў перадачы гал. мэты графікі падзяляюцца на: аргаграмы (выражаюць структуру аб'екта і ўзаемасувязі яго частак); хранаграмы і тапаграмы (паказваюць змены вытворчага працэсу ў часе і ў прасторы); дыяграмы (графікі колькасных суадносін); разліковыя графікі; змешаныя графікі.

Статыстычна-эканам. графіраванне ўзнікла ў 2-й пал. 18 ст. З сярэдзіны 60-х г. 19 ст. выкарыстоўваецца для рэгулявання руху на чыгунках. У прыкладную навук. галіну кіравання вытворчасцю афармілася ў пач. 20 ст. пасля практ. выкарыстання графікаў у гэтай справе амер. інжынерамі Ф. У. Тэйларам і Г. Л. Гантам. У СССР выкарыстоўваюцца ў кіраванні вытворчасцю з 20-х г. 20 ст. Гл. таксама *Графаў тэорыя, Гульняў тэорыя, Сеткавае планаванне, Транспартная задача.*

Літ.: Герчук Я. П. Графические методы планирования и учета производства, М., 1935; Ягодж. Графические методы в статистике, М., 1968 (бібліягр.); Бызов Л. А. Методы графических изображений. Курс лекций, М.—Л., 1930; Дейнеко О. А. Использование графиков в управлении производством, у кн.: Научные основы управления производством, М., 1969; Пищулин И. П. Анализ организации и управления производством с помощью графических методов, М., 1967; Шмидк К. Ф. Руководство по графическим изображениям, пер. с англ., М., 1960; Кнеппель Ч. Э. Графические методы управления предприятием, пер. с англ., 2 изд., Л.—М., 1931; Авондо Бодино Дж. Применение в экономике теории графов, пер. с англ., М., 1966.

У. А. Салановіч. Мінск.

...ГРАФІЯ (ад грэч. gráphō пішу), частка складаных слоў, якая азначае апісанне, запіс, малюнак, напр., *біяграфія, літаграфія.*

ГРАХОЎСКІ Сяргей Іванавіч [н. 12(25).9. 1913, мяст. Нобель Пінскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі паэт. З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1935). Працаваў рабочым на Бабруйскім дрэваапр. камбінаце (1930—31), рэд. Бел. радыё (1935—36), настаўнікам на Случчыне (1946—49) і ў Новасібірскай вобл. (1950—56), у час. «Бярозка» (1957—59). З 1960 у час. «Вясёлка». Друкуецца з 1926. Першы зб. «Дзень нараджэння» (1958). Гісторыка-рэвалюц. тэма, матывы маральнай чысціні чалавека — асн. ў паэзіі Г. Многія вершы — старонкі біяграфій камсамольцаў 30-х г., успаміны пра гераізм і



самаахвярнасць у Айч. вайну, выяўленне дум і перажыванняў, звязаных з абаронай міру, паэтызацыяй працы. Рэаліст.-канкрэтная вобразнасць, класічная метрыка і строфіка, жыццярадасная светласць, часам элегічная журботнасць — рысы стылю Г. Выступае як празаік (аповесць «Рудабельская рэспубліка», 1967; інсцэніравана, паст. т-рам імя Я. Купалы, 1968; зб. апавяд. «Які вялікі дзень», 1966; нарысаў «Горад маладосці», 1960). Піша для дзяцей (зб. «Сёння і заўтра», 1961; «Гарыць касцёр», 1966).

Тв.: Ад вясны да вясны, Мн., 1959; Чаканне, Мн., 1960; Табе зайздросціць сонца, Мн., 1963; Памяць, Мн., 1965; Тры вымярэнні, Мн., 1967; Вершы, Мн., 1968; Паэма дарог, Мн., 1970; Пражытае і перажытае, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Арочка М. Мера патрабавальнасці, «Полымя», 1966, № 1; Бугаёў Дз. Паэзія Сяргея Грахоўскага, «Полымя», 1963, № 9; Голубева Л. Аповесць пра народных змагароў, «Полымя», 1968, № 12; Яскевіч А. Голас сэрца, «Маладосць», 1959, № 2.

А. А. Лойка. Мінск.

ГРАЦЫЯНАЎ Пётр Аляксеевіч [31.5(12.6). 1855, Ніжні Ноўгарад — 1918], беларускі вучоны ў галіне санітарыі. Скончыў Пецярбургскую мед.-хірург. акадэмію (1880). Урач сельскага лекарскага ўчастка на Беларусі (1888—90), першы сан. ўрач Мінска і гал. ўрач інфекц. шпіталя (1891—1903). Распрацаваў методыку рэгістрацыі інфекц. хвароб і іх шпітальнага лячэння. Пры яго ўдзеле адкрыты ў Мінску шпіталь для лячэння інфекц. хвароб (1891) і мед.-стат. бюро (1899).

Тв.: Очерк врачебно-санитарной организации русских городов, Мн., 1899.

ГРАЧАНІКАЎ Анатоль Сямёнавіч (н. 8.9. 1938, в. Шарпілаўка Гомельскага р-на), беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1963. З сялян. Скончыў Бел. ін-т інжынераў чыг. транспарту (1960), Выш. літ. курсы пры СП СССР у Маскве (1969). Працаваў інжынерам, на камсамольскай рабоце. З 1969 у газ. «Літаратура і мастацтва». З 1971 нам. старшыні праўлення СП БССР. Друкуецца з 1957. Першы зб. вершаў «Магістраль» (1964). Канкрэтнасць паэт. дэталі, імкненне да сюжэтна арганізаванага верша — асаблівасці лірыкі Г.

Тв.: Круглая площча, Мн., 1971.

Літ.: Грахоўскі С. Шчаслівая пара, «Полымя», 1965, № 4; Бур'ян Б. Адчуванне сюжэта, «Маладосць», 1965, № 9.

Н. С. Гілевіч. Мінск.

ГРАЧАНІНАЎ Аляксандр Ціханавіч [13(25). 10.1864, Масква — 3.1.1956], рускі кампазітар. Праф. Вучань В. Сафонава і М. Рымскага-Корсакава. З 1925 жыў у Парыжы, з 1939 у ЗША. Самае каштоўнае ў вял. спадчыне Г.— вак. музыка (асабліва рамансы) і творы для дзяцей. Працуючы ў *Музычна-этнаграфічнай камісіі* і *Беларускай песеннай камісіі*, пазнаёміўся з бел. муз. фальклорам, глыбока адчуў своеасаблівасць яго ладава-інтанацыйнай будовы. Даў класічныя ўзоры апрацовак бел. песень (17 для голасу і фп., 11 для мяшанага хору; апрача таго, многа апр. загінула ў час вайны). На тэмы нар. песень напісаў у Парыжы «Беларускую рапсодыю» для сімф. аркестра і п'есу для скрыпкі і фп. «Дар Белай Русі». Аўтар музыкі да п'есы В. Шашалевіча «Апраметная» (паст. 1926, БДТ-2 — т-р імя Я. Коласа).

Тв.: Оперы «Дабрыня Мікітавіч» (1901), «Сястра Беатрыса» (1910), «Жаніцьба» (1946); 3 дзіцячыя оперы; кантаты, у т. л. «Да перамогі» (у гонар Сав. Арміі, 1943); літургіі, месы; 6 сімфоній; інстр. ансамблі, санаты, фп. п'есы, дух. і свецкія хоры, болей за 200 рамансаў, дзіцячыя песні і хоры, музыка да спектакляў.

Р. Р. Шырма. Мінск.

ГРАЧАНІЧЭНКА Уладзімір Аляксеевіч [н. 16(29).1.1908, в. Шпілеўка Сумскага пав. Харкаўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1941). У Чырв. Арміі з 1928. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У партызанах з мая 1942 — камандзір і камісар атрада; з 1943 камісар *партызанскай брыгады 1-й Беларускай кавалерыйскай* у Баранавіцкай вобл. З 1944 на 2-м Укр. фронце. Удзельнік вызвалення Венгрыі, Чэхаславакіі. У 1945—58 у Сав. Арміі. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Краснадары.

ГРАЧУШКІН Дзмітрый Фёдаравіч (10.4. 1921, в. Талкоеўка Бузулуцкага пав. Самарскай губ.— 29.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Узвод процітанкавых ружжаў пад камандаваннем Г. фарсіраваў Дняпро, у баі за в. Галкі адбіў танкавую атаку праціўніка. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Камарыне.

ГРАЧУШЫНА, гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры* (3—4 ст.) каля в. Грачушына Расонскага р-на Віцебскай вобл. Даследаваў А. Р. Мітрафанаў (1949). Знойдзены абломкі гліняных гладкасценных посудзін.

Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины, у кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики, М., 1959 (Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции, [т.] 1).

ГРАЧЫНСКІ Вітольд Феліксавіч (н. 30.4. 1922, Масква), рускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1964). Скончыў Варонежскае тэатр. вучылішча (1942). У 1942—45 артыст армейскіх ансамбляў. Працаваў у філармоніях Варонежа, Іжэўска, Мікалаева, у т-рах Варонежа, Нальчыка. У 1950—55 у Брэсцкім т-ры імя ЛКСМБ, 1955—56 і з 1958 у Гродзенскім т-ры. Характарны акцёр. Ролі ў Брэсцкім т-ры: Віктар Смагін («Домік на ўскраіне» А. Арбузава), Міхаіл («Зыкавы» М. Горкага), Мошкін («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка); у Гродзенскім т-ры: Цыганоў («Варвары» М. Горкага), Тузенбах («Тры сястры» А. Чэхава), Андрэй («У добры час!» В. Розава), О'Крэдзі («Дыпламат» С. Алёшына), Савіч («Сэрца на далоні» па І. Шамякіну), Збышка («Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай).

ГРАШОВАЕ АБАРАЧЭННЕ, няспынны рух грошай у працэсе абарачэння тавараў, аказання паслуг і выканання плацяжоў. Абумоўлена таварным абарачэннем. Формы Г. а. залежаць ад тыпу *сярашовых сістэм.* Колькасць грошай, неабходных для абарачэння, павінна быць роўнай суме таварных цэн, падзеленых на лік абаротаў аднайменных грашовых знакаў, з улікам плацяжоў за тавары, прададзеныя ў крэдыт. Пры капіталізме Г. а. абслугоўвае

кругазварот капіталу, рэалізацыю заработнай платы наёмных рабочых і даходаў іншых слаёў грамадства. Мае стыхійны інфляцыйны характар. У сацыяліст. краінах абслугоўвае працэс сацыяліст. ўзнаўлення. Рэгулюецца на аснове планавання дзярж. фінансаў, складання *крэдытных планаў, касавых планаў* Дзяржбанка, *балансу грашовых даходаў і расходаў насельніцтва.* Асновай планавага развіцця Г. а. з'яўляюцца грамадская сацыялістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці і канцэнтрацыя ў руках дзяржавы вялікай колькасці тавараў, што вырабляюцца на сацыяліст. прадпрыемствах і планава рэалізуюцца.

Літ.: Гл. пры арт. *Грошы. Б. П. Сапешка.* Мінск.

ГРАШОВА-КРЭДЫТНЫ КРЫЗІС, эпізадычнае або хранічнае расстройства грашова-крэдытнай сістэмы (*грашовае абарачэнне, крэдыт, банкі* і *біржы)* капіталіст. краін.

Адрозніваюць цыклічныя крызісы, выкліканыя *эканамічнымі крызісамі*, і Г.-к. к., выкліканыя надзвычайнымі паліт. або інш. падзеямі (вайна, разрыў эканамічных сувязей і інш.). Характарызуюцца вострым недахопам грошай, надзвычайным попытам на золата, масавым зняццем укладаў з банкаў, крахам банкаў, недастачай пазыковага капіталу, зніжэннем курсаў каштоўных папер і скарачэннем іх эмісій, ростам дэфіцыту плацежнага балансу, скарачэннем вывазу капіталу, уцечкаю золата за мяжу. Вядзе да яшчэ большага абяднення працоўных. Сацыяліст. эканоміка, заснаваная на грамадскай уласнасці на сродкі вытворчасці, ліквідуе асновы Г.-к. к.

Літ.: Гл. пры арт. *Грошы, Крэдыт.*

ГРАШОВА-РЭЧАВАЯ ЛАТАРЭЯ, від *латарэі*, у якой разыгрываюцца грашовыя і рэчавыя выйгрышы. Латарэі ў СССР звычайна грашова-рэчавыя. З 1958 праводзяцца ў саюзных рэспубліках, даходы ад іх паступаюць у дзярж. бюджэт гэтых рэспублік. Пералік і колькасць выйгрышаў зацвярджаюцца Саветамі Міністраў рэспублік.

ГРАШОВАЯ АДЗІНКА, вызначаная ў заканадаўчым парадку колькасць золата, якая з'яўляецца *маштабам цэн.* У кожнай краіне мае сваю назву і пераважна дзеліцца на сто частак.

Г. а. краін свету: *афгані* (Афганістан), *балівар* (Венесуэла), *бальбоа* (Панама), *бат* (Тайланд), *вона* (КНДР, Паўд. Карэя), *гварані* (Парагвай), *гульдэн*, або фларын (Нідэрланды і інш.), *гурд* (Гаіці), *долар* (Аўстралія, ЗША, Канада і інш.), *донг* (ДРВ), *драхма* (Грэцыя), *дынар* (Адэн, Алжыр, Ірак і інш.), *дырхем* (Марока), *заір* (Дэмакр. Рэсп. Конга), *злоты* (Польшча), *квача* (Замбія), *кетсал* (Гватэмала), *кіп* (Лаос), *кордаба* (Нікарагуа), *крона* (Нарвегія, Чэхаславакія і інш.), *крузейра* (Бразілія), *к'ят* (Бірма), *лей* (Румынія), *лек* (Албанія), *леоне* (Сьера-Леоне), *лея* (Балгарыя), *ліра* (Італія, Турцыя), *лемпіра* (Гандурас), *марка* (ГДР, Фінляндыя, ФРГ), *паанга*, або долар Тонгі (Тонга), *патака* (Аамынь), *песа* (Аргенціна, Балівія, Куба і інш.), *піястр* (Паўд. В'етнам), *песета* (Іспанія, Сахара Зах., Экватарыяльная Гвінея), *рубель* (СССР), *рупія* (Індыя, Інданезія і інш.), *рыель* (Камбоджа), *рыял* (Аман Дагаворны, Іран, Емен, Саудаўская Аравія), *рэнд* (Батсвана, Лесота, Свазіленд, Паўд.-Афрыканская Рэспубліка, Паўд.-Зах. Афрыка), *седзі новы* (Гана), *соль* (Перу), *сукрэ* (Эквадор), *тала*, або долар Самоа (Самоа Заходняе), *талер Марыі Тэрэзіі* (Аман), *тугрык* (МНР), *форынт* (Венгрыя), *франк* (Бельгія, Францыя і інш.), *фунт* (ААР, Ізраіль, Гамбія і інш.), *фунт стэрлінгаў* (Вялікабрытанія), *шылінг* (Аўстрыя, Кенія і інш.), *эскуда*, або анголар (Ангола), *эскуда* (Мазамбік, Зялёнага Мыса астравы, Партугалія, Сан-Таме і Прынсіпі, Тымор, Чылі), *юань* (КНР).

Літ.: Валюты стран мира. Справочник, М., 1970.
З. І. Гіяргідзе. Мінск.

ГРАШОВЫ КАПІТАЛ, сума грошай, якая прыносіць яе ўладальніку прыбытак за кошт эксплуатацыі наёмнай працы. У рабаўладальніцкім і феад. грамадствах існаваў у форме гандл. і ліхвярскага капіталу. Пры капіталізме — адна з формаў *прамысловага капіталу.* Грошы выступаюць як Г. к. не самі па сабе, а таму, што яны выкарыстоўваюцца капіталістам для куплі сродкаў вытворчасці і рабочай сілы. Капіталіст не проста выдаткоўвае на гэта грошы, а авансуе іх як вартасць, якая павінна даць прыбытак, вырасці на велічыню прыбавачнай вартасці. Г. к. з'яўляецца т. ч. зыходнай формай прамысл. капіталу, дае пачатак яго руху. Пасля рэалізацыі тавару прамысл. капітал зноў набывае форму Г. к. Частка яго, якая вызваляецца ў працэсе кругазвароту капіталу, можа ператварацца ў *пазыковы капітал.*

Літ.: Гл. пры арт. *Капітал.*

ГРАШОВЫЯ ЗНАКІ, заменнікі залатых або сярэбраных грошай у грашовым абарачэнні. У якасці Г. з. выступаюць непаўнацэнныя *манеты* з медзі, нікелю і іх сплаваў, *папяровыя грошы* і *банкаўскія білеты.* Гл. таксама *Грошы, Баністыка.*

ГРАШОВЫЯ РЭФОРМЫ, пераўтварэнні, якія праводзіць дзяржава, каб упарадкаваць *грашовае абарачэнне.* У залежнасці ад спосабу вытворчасці, паліт. і эканам. стану краіны ажыццяўляюцца шляхам зняцця з абарачэння папяровых грошай і замены іх новымі, зменай залатой вартасці грашовых знакаў і іх валютнага курсу і інш.

Віды Г. р.: 1) пераход ад аднаго да іншага тыпу *грашовых сістэм*; 2) замена непаўнацэнных або абясцэненых манет; 3) змены ў сістэме эмісіі грошай; 4) стабілізацыя валюты або частковыя меры для ўпарадкавання грашовага абарачэння метадамі *дэнамінацыі, нуліфікацыі грошай, дэвальвацыі, рэвальвацыі*; 5) стварэнне новай грашовай сістэмы ў сувязі з дзярж. пераўтварэннем. Пры сацыялізме Г. р. спрыяюць далейшаму развіццю сацыяліст. эканомікі, павышаюць устойлівасць валюты, дабрабыт працоўных. У СССР Г. р. 1922—24 замяніла абясцэненыя папяровыя грошы банкаўскімі білетамі (чырвонцамі), а саўзнакі — казначэйскімі білетамі. Г. р. 1947 стабілізавала грашовае абарачэнне. Абясцэненыя ў час 2-й сусв. вайны грашовыя знакі былі заменены новымі ў суадносінах 10 : 1. У капіталіст. краінах Г. р. выкарыстоўваюцца ў інтарэсах эксплуататарскіх класаў і накіраваны супраць працоўных: суправаджаюцца ростам падаткаў, цэн, скарачэннем сац. выдаткаў дзяржавы. У краінах, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, Г. р. маюць прагрэс. характар, умацоўваюць іх эканам. незалежнасць.

Літ.: Гл. пры арт. *Грошы. В. А. Драздоў.* Мінск.

ГРАШОВЫЯ СІСТЭМЫ, формы арганізацыі і дзярж. рэгулявання *грашовага абарачэння.* Асновай Г. с. з'яўляецца тавар, які выконвае ролю ўсеагульнага эквіваленту.

Адрозніваюць наступныя тыпы Г. с.: 1) *монаметалізм*, пры якім ролю грошай выконвае золата; 2) *біметалізм*, калі функцыю ўсеагульнага эквіваленту выконваюць залатыя або сярэбраныя манеты; 3) папярова-грашовая сістэма з абарачэннем казначэйскіх білетаў, банкнотаў і манет, якія не разменьваюцца на золата; 4) сістэма крэдытнага абарачэння з разменам або без размену банкнотаў на золата. У перыяд агульнага крызісу капіталізму монаметалізм у капіталіст. краінах змяніўся інфляцыйным грашова-папяровым абарачэннем. У сацыяліст. краінах Г. с.— крэдытнага абарачэння. У СССР у грашовым абарачэнні знаходзяцца



1



2



3



4




5

Графіка I. 1. Мікеланджэла. Малюнак да плафона Сіксцінскай капэлы. Каля 1508—12. 2. А. Дзюрэр. Меланхолія. Гравюра разцом на медзі. 1514. 3. П. Дзюмусцье Старэйшы. Партрэт Э. Дзюмусцье. Італьян. аловак, сангіна, пастэль. 1569. 4. А. Дам'е. Вуліца Транснанен 15 крас. 1834 г. Літаграфія. 1834. 5. Дж. Б. Піранезі. Афорт з серыі «Турмы». 1745 (1750)—1761. 6. Торыі Кіёнага. Хлопчык у выглядзе бажаства Эбісу. Каляр. ксілаграфія. Канец 18 ст. 7. Р. Кент. Іл. да «Поля Бэньяна» Э. Шэпарда. Ксілаграфія. 1941. 8. П. Пікасо. Плакат, прысвечаны Усв. кангрэсу прыхільнікаў міру ў Парыжы. 1949.



6



7



8



1



2



3



4



5

Графіка II. 1. «Даниилу, седящему со львы, принесе Аввакум обед». Загаловачны ліст кн. «Данііл-прарок» з «Бібліі» Ф. Скарыны. Гравюра на дрэве. Прага. 1519. 2. А. А. Кіпрэнскі. Сляпы музыкант. Малюнак. Італьян. аловак. 1809. 3. Мядзведзь з казою прахалоджваюцца. Лубок. Ксілаграфія. 18 ст. 4. А. А. Іванаў. Жаніх купляе пярсцёнак нявесце. Акварэль. 1838. 5. П. М. Баклеўскі. Грамадскія адносіны бюракратаў. Малюнак з альбома «Бюракратычны катэхізіс». Пяць сцэн з «Рэвізора». Літаграфія. 1863. 6. Дз. С. Маор. «Дапамажыі». Плакат. 1921—22. 7. Я. А. Кібрык. Ласачка. Іл. да «Кала Бруньёна» Р. Ралана. Літаграфія. 1935. 8. Кукрыніксы. «Згубіла я пярсцёнак!.. (а ў пярсцёнку 22 дывізіі)». Карыкатура. 1943.



6



7



8



1



2



3




4



5


Графіка III. 1. В. П. Шаранговіч. Іл. да паэмы «Уладзімір Ільіч Ленін» У. Маякоўскага. Аўталітаграфія. 1969. 2. Н. М. Паплаўская. Нядзеля. Літаграфія. 1968. 3. С. Р. Рамана ў. К. Заслонаў у дэпо ст. Орша ў 1941 годзе. Малюнак вугалем. 1952. 4. С. П. Герус. Будаўнік Мінска. Лінагравюра. 1958. 5. Б. А. Забораў. Іл. да верша «Выпраўляла маці сына» Я. Купалы. Лінагравюра. 1967. 6. А. А. Паслядовіч. Шахцёр. Каляровы афорт. 1961. 7. Э. К. Агуновіч. Іл. да паэмы «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі. Літаграфія. 1969.




6



7



1



2



3



4

Гродзенскі хімічны камбінат імя С. В. Прытыцкага.

1. Панарама вытворчасці капралактаму.
2. Цэх гідравання бензолу.
3. Адпраўка сернай кіслаты.
4. Цэнтральны пульт кіравання вытворчасці капралактаму.
5. Санаторый-прафілакторый камбіната.
6. Рэпетыцыя інструментальнага ансамбля дзіцячага сада камбіната.



5



6

банкаўскія білеты Дзяржбанка СССР, *казначэйскія білеты*, а таксама разменная манета.

Літ.: Гл. пры арт. *Грошы*.

ГРАШЧАНКАЎ Мікалай Іванавіч [13(26).3.1901, в. Забор'е Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ.— 8.10.1965], савецкі вучоны ў галіне неўрапаталогіі і нейрафізіялогіі. Акад. АМН СССР (1944) і АН БССР (1947), чл.-кар. АН СССР (1939). Чл. КПСС з 1918. У 1926 скончыў мед. ф-т Маскоўскага ун-та. З 1939 дырэктар Усесаюзнага ін-та эксперым. медыцыны. Прэзідэнт АН БССР (1947—51). З 1951 заг. кафедры неўрапаталогіі Цэнтр. ін-та ўдасканалення ўрачоў і клініка-фізіял. лабараторыі АН СССР і АМН СССР, з 1958 — 1-га Маскоўскага мед. ін-та. Аўтар прац па фізіялогіі і паталогіі органаў пачуццяў, інфекцыйных хваробах і траўматычных пашкоджаннях нервовай сістэмы. Упершыню апісаў газавую гангрэну мозгу. Даследаваў этыялогію і прапанаваў лячэнне нейравірусных хвароб. У БССР заснаваў нейрахірургічны цэнтр Ін-та неўралогіі, фізіятэрапіі і нейрахірургіі. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Анаэробная инфекция мозга, М., 1944; Очерки вирусных поражений центральной нервной системы, [Мн.], 1951; Гипоталамус. Его роль в физиологии и патологии, М., 1964.

Літ.: Николай Иванович Гращенков, «Журнал невропатологии и психиатрии», 1966, № 1.

ГРОДЗЕНСКАЕ ЎЗВЫШША, зах. частка Беларускай марэннай грады. Вылучаецца як фіз.-геагр. падраён яе паўд.-зах. галіны. Усх. частка Г. ў. ў межах БССР, заходняя ў Польшчы (Беластоцкае ўзв.). Прыўзнята над узр. м. да 238 *м*.

Узгорыста-марэнныя участкі, радзей камавыя ўзгоркі ў спалучэнні з платопадобнымі ўзнікламі пад уплывам ледавіковай акумуляцыі і далейшай перапрацоўкі працэсамі саліфлюкцыі і дэнудацыі. Украіны значна расчлянёны эрозіяй. Ад Ваўкавыскага ўзв. аддзелена далінай р. Свіслач, левага прытока Нёмана. Глебы дзярнова-падзолістыя суглінкавыя, радзей супескавыя, на асобных участках на лёсападобных суглінках. Большая частка тэр. пад ворывам. Лясы пераважна хваёвыя (невялікія ўчасткі) з прымессю шыракалістых парод. Па далінах Свіслачы заліўныя лугі і балоты.

ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗА́ЦЫЯ, абласная арганізацыя Кампартыі Беларусі.

Падпольныя рэвалюц. арг-цыі на тэр. Гродзенскай вобл. ўзніклі ў 80-я г. 19 ст. У 2-й пал. 90-х г. у Гродне і Смаргоні існавалі с.-д. гуркі. Пад уздзеяннем ленінскай «Искры» і рашэнняў II з'езду РСДРП у 2-й пал. 1903 і ў 1904 створаны с.-д. арг-цыі ў Ашмянах, Гродне, Лідзе, Смаргоні, Слоніме (гл. *Ашмянская арганізацыя РСДРП, Гродзенская арганізацыя РСДРП, Смаргонская арганізацыя РСДРП, Лідская арганізацыя РСДРП*). Яны падтрымлівалі цесную сувязь з *Паўночна-Заходнім камітэтам РСДРП*, пазней з *Паўночна-Заходнім саюзам РСДРП, Абласным саюзам РСДРП Літвы і Беларусі*. Рэвалюц. выступленні рабочых адбыліся ў Гродне ў 1895, 1899, 1900, 1901, 1903, 1904, у Смаргоні ў 1895, 1896, 1900, 1901, 1903, 1904, у Слоніме і Ваўкавыску ў 1904. У Ашмянскім і Слонімскім паветах у пач. 900-х г. мелі месца значныя сялянскія хваляванні. Пад кіраўніцтвам арг-цый РСДРП працоўныя Гродзеншчыны актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. Забастоўкі пратэсту супраць расстрэлу 9.1.1905 у Пецярбурзе, першамайскія стачкі і дэманстрацыі адбыліся ў Ашмянах, Ваўкавыску, Гродне, Лідзе, Скідалі, Смаргоні. У час Усерасійскай кастр. паліт. стачкі 1905 баставалі рабочыя Гродна, Смаргоні, Ашмян, Ліды, Навагрудка, у Ваўкавыску ўзнік стачачны к-т. У Гродне, Слоніме і Свіслачы ўвосень 1905 выступала вучнёўская моладзь. Рабочыя Гродзеншчыны актыўна падтрымалі Снежаньскае ўзбр. паўстанне ў Маскве. У Гродне прайшла ўсеагульная паліт. забастоўка, у Ваўкавыску чыгуначнікі на некалькі дзён узялі пад кантроль станцыю. Рэвалюц. работа сярод сялянства вялася пад кіраўніцтвам *Віленскай акруговай арганізацыі РСДРП*, у якую да лета 1906 уваходзілі амаль усе с.-д. арг-цыі Гродзеншчыны. Летам 1906 створана Гродзенская акруговая арг-цыя РСДРП (гл. *Акруговыя арганізацыі РСДРП*). У перыяд рэвалюцыі 1905—07 у Гродзенскім пав. адбылося 49 сялянскіх выступленняў, у Ваўкавыскім 38, Ашмянскім 20, Лідскім 17. Толькі ў 1905 у Гродзенскай губ. прайшло 1268 стачак, баставала 49 457 чал. Пры групах РСДРП у Гродне, Лідзе, Слоніме існавалі ваенна-рэвалюц. арг-цыі, якія ўзначалілі салдацкія выступленні летам і ўвосень 1905. У перыяд рэакцыі с.-д. арг-цыі Гродзеншчыны панеслі цяжкія страты, але не парывалі сувязі з масамі. У канцы 1908 адновіла дзейнасць Гродзенская група РСДРП. С.-д. арг-цыі існавалі ў Лідзе, Смаргоні, Ашмянах. У гады новага рэвалюц. ўздыму рабочы і сялянскі рух на Гродзеншчыне ўмацніўся. У жн. 1911 баставалі рабочыя гуты «Нёман» (Лідскі павет), у крас. 1912 друкары Гродна, у ліст. 1912 і ў 1913 гарбары Смаргоні, у крас. 1914 рабочыя цагельняў Гродзенскага пав. і інш. У 1912 зноў афармілася група РСДРП у Смаргоні, узнікае с.-д. арг-цыя ў Навагрудку. У 1-ю сусв. вайну амаль уся тэр. сучаснай Гродзенскай вобл. была акупавана ням. войскамі, партыйныя арг-цыі існавалі падпольна. Пад іх кіраўніцтвам працоўныя Гродзеншчыны вялі барацьбу супраць акупантаў, якая пасля перамогі Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. перарасла ў барацьбу за аб'яднанне з Савецкай Расіяй. У студз.— лютым 1918 актывізавалі дзейнасць падпольныя партыйныя арг-цыі ў Гродне, Ашмянах, Слоніме, Ваўкавыску, Міры, Зэльве, Свіслачы і інш. нас. пунктах. Яны наладзілі сувязь з ЦК, Паўн.-Зах. абласным к-там РСДРП(б). На Гродзеншчыне прайшлі стачкі пратэсту супраць акупацыі, адбылася забастоўка рабочых тытунёвай ф-кі ў Гродне, шырыўся партыз. рух. Партыз. атрад (200 чал.) разграміў ням. гарнізон у м. Турэц Навагрудскага пав. Пасля выгнання ням. акупантаў у снеж. 1918 — студз. 1919 на значнай частцы Гродзеншчыны ўстаноўлена Сав. ўлада, створаны валасныя, павятовыя і губернскі рэўкомы. Ва ўмовах акупацыі з вясны 1919 войскамі бурж.-памешчыцкай Польшчы на Гродзеншчыне падпольна дзейнічалі арг-цыі Камуніст. партыі (бальшавікоў) Літвы і Беларусі [КП(б)ЛіБ] і асобныя групы камуністаў. У ліп. 1920 уся тэр. Гродзеншчыны была вызвалена ад інтэрвентаў, і часова тут устанавілася Сав. ўлада. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 Гродзеншчына заставалася пад Польшчай. Да кастр. 1922 рэвалюц. рухам у ёй кіравалі арг-цыі Камуніст. рабочай партыі Польшчы (КПРП) і Камуніст. партыі Літвы, а з кастр. 1922 да кастр. 1923 арг-цыі КПРП. У 1921 падпольныя парт. арг-цыі існавалі ў Гродне, Слоніме, Лідзе, Ашмянах. Пасля стварэння ў кастр. 1923 *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі* (КПЗБ) на тэр. Гродзенскай вобл. дзейнічалі 4 акруговыя к-ты КПЗБ (Гродзенскі, Слонімска-Баранавіцкі, Навагрудскі, Лідскі), 25 раённых і гарадскіх к-таў. Яны ўзначальвалі барацьбу працоўных за сац. і нац. вызваленне. Пад кіраўніцтвам КПЗБ падпольную работу вялі арг-цыі *Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі* (КСМЗБ), а таксама гуркі масавай легальнай рэвалюц. нацыянальна-вызваленчай арг-цыі *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ). КПЗБ падрыхтавала і ўзначаліла найб. буйныя выступленні працоўных Гродзеншчыны: забастоўку рабочых запалкавай ф-кі ў Гродне (1927), на гуце «Нёман» Лідскага пав. (1929), выступленне сялян в. Асташына Навагрудскага пав. (1932; гл. *Асташынскае выступленне сялян*),

забастоўку на фанерным з-дзе ў Мастах (1933), на ф-цы гумавага абутку «Ардаль» у Лідзе (1936). Актыўныя дзеячы КПЗБ і КСМЗБ на Гродзеншчыне: Х. М. Александровіч, М. Т. *Анішчык*, А. І. Багданчук, С. Я. *Багданчук*, В. Ф. Валейка, П. Ф. Дзмітрук, П. А. *Жалезняковіч*, Ф. Д. Кавалеўскі, Ю. І. Кавалеўскі, П. С. *Крынчык*, М. Е. *Крыштафовіч*, А. В. Малец, М. Я. Міхалоўскі, А. В. Прытыцкі, Р. А. Пірышка, Х. Я. Хомскі, У. З. *Царук*, Л. Р. *Шайкоўскі*; І. Я. *Дабрыян*, В. П. Ласковіч, І. В. *Малец*, С. В. *Прытыцкі*, В. П. *Таўлай*, В. З. *Харужая*.

Пасля ўз'яднання ў 1939 з БССР у зах. абласцях Беларусі створаны пярвічныя арг-цыі КП(б)Б. На 1.3.1940 на тэр. сучаснай Гродзенскай вобл., якая паводле адм. падзелу 1939 увайшла ў склад Беластоцкай, Баранавіцкай, Вілейскай і Брэсцкай абласцей, дзейнічалі 27 раённых, 1 гарраённая і 1 гарадская парт. арг-цыі. Яны аб'ядноўвалі 1430 камуністаў. Пад кіраўніцтвам парт. арг-цый ажыццяўляліся карэнныя сацыяліст. пераўтварэнні.

У Вял. Айч. вайну камуністы Гродзеншчыны ўзначалілі барацьбу працоўных супраць фаш. захопнікаў. Першыя партыз. групы і падпольныя арг-цыі на тэр. вобласці ўзніклі ўвосень 1941. Вясною 1943 пачалі дзейнічаць *Вілейскі падпольны абком КП(б)Б* (сакратары І. Ф. *Клімаў*, А. А. *Манахаў*) і *Баранавіцкі падпольны абком КП(б)Б* (сакратары В. Я. *Чарнышоў*, Ф. А. *Баранаў*), а ў ліст. 1943 *Беластоцкі падпольны абком КП(б)Б* (сакратары В. Е. *Самуцін*, Д. К. *Сукачоў*), 23 падпольныя гаркомы і райкомы. На Гродзеншчыне дзейнічалі *Беластоцкае партызанскае злучэнне*, часткова Баранавіцкае і Вілейскае партызанскія злучэнні, а таксама асобна дзейныя брыгады і атрады. Пад кіраўніцтвам падпольных парт. арг-цый на Гродзеншчыне з ням.-фаш. захопнікамі змагалася таксама камсамольскае падполле на чале з Беластоцкім, Баранавіцкім і Вілейскім падпольнымі абкомамі і 28 падпольнымі гаркомамі і райкомамі ЛКСМБ, антыфашысцкае патрыят. падполле, якое ўзначальвалі *Беластоцкі абласны антыфашысцкі камітэт* і *Баранавіцкі акруговы антыфашысцкі камітэт*. Выдаваліся падпольныя газеты: 7 абласных («Белостокская правда» Беластоцкага, «Чырвоная звязда» Баранавіцкага, «Сялянская газета» Вілейскага падпольных абкомаў КП(б)Б, «Молодой партизан» Беластоцкага, «Молодой мститель» Баранавіцкага, «Молодежная правда», «Молодежь Белоруссии в борьбе за Родину» Вілейскага падпольных абкомаў ЛКСМБ) і 19 раённых. Пасля выгнання ням.-фаш. захопнікаў у ліп. 1944 парт. арг-цыі Гродзеншчыны ўзначалілі барацьбу працоўных за аднаўленне і развіццё нар. гасп. У вер. 1944 створана Гродзенская вобл. і абласная парт. арг-цыя. На 1.10.1944 у Гродзенскай абл. парт. арг-цыі налічвалася 76 пярвічных арг-цый і 5 канд. груп, якія аб'ядноўвалі 1289 чл. і канд. у чл. партыі. Пасля ўзбуйнення Гродзенскай вобл. (далучана частка Баранавіцкай вобл.) на 1.1.1954 абл. парт. арг-цыя налічвала 737 пярвічных арг-цый і 8 канд. груп, у якіх аб'яднана 8350 чл. і канд. у чл. партыі. Паводле рашэння ліст. (1962) Пленума ЦК КПСС Г. а. п. а. з студз. 1963 да снеж. 1964 падзялялася на сельскую і прамысловую парт. арг-цыі (адпаведна ўтворацы сельскі і прамысловы абкомы). На 1.1.1965 у складзе абл. парт. арг-цыі 1337 пярвічных арг-цый, 35 645 чл. і канд. у чл. партыі. На 1.1.1971 Гродзенская абл. парт. арг-цыя налічвала 45 452 чл. і канд. ў чл. КПСС, аб'яднаных у 2 гарадскіх, 17 раённых, 1538 пярвічных парт. арг-цыях. Камуністы ўзначальваюць адказныя ўчасткі народнай гаспадаркі і ідэалагічныя ўстановы, з'яўляюцца арганізатарамі самаадданай барацьбы працоўных за здзяйсненне планаў камуніст. буд-ва. Друкаваны орган Гродзенскага абл. і гар. камітэтаў КПБ, абл. і гар. Саветаў дэпутатаў працоўных — газ. *«Гродненская правда»*. У вобласці выдаецца 17 раённых газет. Першымі сакратарамі Гродзенскага абкома КПБ працавалі П. З. *Калінін* (кастр. 1944 — снеж. 1948), С. В. *Прытыцкі* (снеж. 1948 — кастр. 1951), М. Я. *Аўхімовіч* (кастр. 1951 — жн. 1953), Ф. А. *Баранаў* (жн. 1953 — люты 1958), Р. Р. *Панамароў* (люты 1958 — крас. 1962), У. Ф. *Міцкевіч* (крас. 1962 — студз. 1968, студз. 1963 — снеж. 1964 першы сакратар сельскага абкома), В. Ф. Языковіч (студз. 1963 — снеж. 1964 першы сакратар прамысл. абкома), са студз. 1968 І. Ф. *Мікуловіч*. За перыяд існавання Гродзенскай абл. парт. арг-цыі адбылося 14 абл. парт. канферэнцый: I — 19.12.1946; II — 23—24.1.1949; III — 7—8.4.1951; IV — 3—5.9.1952; V — 28.1.1954; VI — 16.12.1955, VII — 6—7.2.1958; VIII — 9.1.1959; IX — 25—26.1.1960; X — 6.9.1961; XI — 12.12.1964; XII — 4.2.1966; XIII — 20—21.2.1968; XIV — 28—29.1.1971. Камсамольская арг-цыя вобласці на 1.1.1971 налічвала 120 039 чл. ЛКСМБ, аб'яднаных у 2125 пярвічных арг-цыях ЛКСМБ.

Кр.: Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), ч. 2 (1919 г.— июнь 1941 г.), Мн., 1962—70; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955; Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1968; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929 гг.), Мн., 1962.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, 2 изд., Мн., 1968, ч. 2, Мн., 1967; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939), Мн., 1966; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962; Починин С. З. В грозовом восемнадцатом, Мн., 1969; Белорусская ССР. Гродненская область, Мн., 1968.

У. А. Нядзелька. Гродна.

ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ ДОСЛЕДНАЯ СТАНЦЫЯ, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні сельскай гаспадаркі. Арганізавана ў 1956 у г. Шчучыне Гродзенскай вобл. на базе Беняконскай с.-г. доследнай станцыі (засн. ў 1910 у мяст. Беняконі). Аддзелы: малочнамясной жывёлагадоўлі, беконнай свінагадоўлі, селекцыі і насенняводства зернебабовых культур, селекцыі і насенняводства збожжавых культур і бульбы, земляробства, культуртэхнікі і лугаводства, аграхіміі, садоўніцтва, навукова-тэхн. інфармацыі і прапаганды, эканомікі, механізацыі; лабараторыя хім. аналізаў. Мае 3 эксперым. базы: «Шчучын» (в. Ражанка Шчучынскага р-на), «Руткевічы» (в. Руткевічы Шчучынскага р-на), «Каст-

рычнік» (в. Жырмуны Воранаўскага р-на). Дырэктар станцыі канд. с-г. н. В. П. Пішчык (з 1965).

Асн. навук. кірункі: удасканаленне і распрацоўка тэхналогіі вырошчвання с.-г. культур у вобласці, распрацоўка прыёмаў насенняводства лугавых траў і павышэнне прадукцыйнасці кармавых угоддзяў, селекцыя лубіну, удасканаленне агратэхнікі садоўніцтва і сартавывучэнне пладовых і ягадных культур, паляпшэнне чырвонай бел. буйной рагатай жывёлы, свіней буйной белай пароды, падбор сістэмы машын для механізацыі работ у жывёлагадоўлі. Выведзены высокаўраджайныя сарты: азімага жыта Беняконскае, лубіну Гродзенскі, Беняконскі-484, Беняконскі-714, Беняконскі-335 і БРС (Беняконскі ружовы салодкі). Выдадзены «Зборнік навуковых прац» (в. 1—2, 1960), кн. «Угнаенне і ўраджай» (1967).

ГРОДЗЕНСКАЯ АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА «Н ё м а н», прадпрыемства лёгкай прамысловасці. Асн. прадукцыя: мужч., жан. і дзіцячы абутак — больш за 20 відаў. Створана ў 1939 (пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР) на базе прыватнай ф-кі. У Айч. вайну разбурана. Першую пасляваенную прадукцыю (24,5 тыс. пар абутку) выпусціла ў 1947. У 1953 далучана абутковая ф-ка інд. пашыўкі. У 1956 праведзена рэканструкцыя. У 1960 выпушчана 1,2 млн., у 1970 — 6,7 млн. пар абутку. Пры ф-цы паліклініка, 2 б-кі, клуб, дзіцячыя дашкольныя ўстановы. *Н. А. Міронава*. Гродна.

ГРОДЗЕНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП (Гродзенская група РСДРП). Першая падпольная рэвалюц. арг-цыя ў Гродне ўзнікла ў 1887 (гл. *Гродзенскі рэвалюцыйны гурток* 1887—94). У 2-й пал. 90-х г. утварыўся с.-д. гурток на чале з П. І. Шумавым, сацыял-дэмакраты Гродна перайшлі да масавай агітацыі. Гурток меў сувязь з пецярбургскімі сацыял-дэмакратамі, распаўсюджваў праклямацыі і лістоўкі ў Гродне і яго ваколіцах. У канцы 1897 гурток раскалоўся па пытанні аб уваходжанні ў Бунд. Прыхільнікі Бунда ўтварылі Гродзенскі с.-д. камітэт, праціўнікі яго — Гродзенскі рабочы камітэт, які выступаў супраць эканамізму і сепаратызму бундаўцаў. Гродзенскі рабочы камітэт удзельнічаў у арганізацыі забастоўкі 1300 рабочых тытунёвай фабрыкі ў 1899. Паліт. платформа камітэта па многіх пытаннях збліжалася з пазіцыяй «Искры», аднак камітэт не стаў іскраўскай арганізацыяй і пазней увайшоў у склад ППС. Пасля II з'езду РСДРП аформілася Гродзенская група РСДРП, якая ўваходзіла ў склад *Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП*. Пад кіраўніцтвам Гродзенскай групы РСДРП у 1904 адбылася першамайская паліт. стачка і дэманстрацыя працоўных. У перыяд рэвалюцыі 1905—07 бальшавікі Гродна ўзначалілі выступленні працоўных, кіравалі падрыхтоўкай і правядзеннем усеагульнай паліт. забастоўкі ў знак пратэсту супраць расстрэлу рабочых у Пецярбурзе 9.1.1905. З 17 да 21 студз. прадпрыемствы Гродна не працавалі. На разгром забастоўкі былі пасланы войскі. Пад кіраўніцтвам Г. а. РСДРП прайшлі забастоўкі ў крас.— маі 1905. У забастоўцы 22—23 чэрв. ў знак пратэсту супраць расстрэлу рабочых Лодзі прынялі ўдзел рабочыя многіх прадпр. Гродна. 12 кастр. пачалася забастоўка чыгуначнікаў, якая 19 кастр. стала ўсеагульнай. Побач з эканам. патрабаваннямі яе ўдзельнікі падтрымалі лозунгі «Далоў самадзяржаўе», «Далоў булыгінскую думу». Рэвалюц. прапаганду сярод салдатаў вяла *Гродзенская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП*. У кастр.— ліст. 1905 у Гродне пад яе кіраўніцтвам адбыліся рэвалюц. выступленні салдатаў. Значным уплывам Г. а. РСДРП карысталася сярод навучэнцаў. Група гімназістаў сацыял-дэмакратаў выдавала ў Гродне літаграфічны час. «Школа», які заклікаў навучэнцаў да ўдзелу ў барацьбе супраць царскага самадзяржаўя. Г. а. РСДРП вяла паліт. работу сярод сялян. Яна да лета 1906 увайшла ў склад *Віленскай акруговай арганізацыі РСДРП*, пасылала прадстаўнікоў на яе канферэнцыі. Летам 1906 створана Гродзенская акруговая арг-цыя РСДРП (гл. *Акруговыя арганізацыі РСДРП*).

Рэвалюц. выступленні ў Гродне адбываліся ў 1906—07. У чэрв. 1906 баставалі рабочыя пераплётнай фабрыкі. Рабочыя прыстані патрабавалі 8-гадзіннага працоўнага дня і дамагліся свайго. У сак. 1907 пад кіраўніцтвам Г. а. РСДРП адбылася забастоўка больш як 2000 рабочых майстэрняў горада, а 26 ліст.— аднадзённая паліт. стачка пратэсту супраць суда над членамі с.-д. фракцыі II Дзярж. думы, якая ахапіла амаль усе прадпрыемствы горада. У 1907 Г. а. РСДРП разгромлена паліцыяй, у канцы 1908 аднавіла сваю работу. Прадстаўнікі Г. а. РСДРП прысутнічалі на нарадзе бальшавікоў Вільні, Гродна, Брэста, Вілейкі (1908) для абмеркавання парадку дня V Агульнарасійскай канферэнцыі РСДРП і партыйнай работы ва ўмовах сталыпінскай рэакцыі. У студз. 1909 прадстаўнік Г. а. РСДРП прысутнічаў на з'ездзе СДКПіЛ. У гады рэакцыі Г. а. РСДРП часова аб'ядноўвалася з арганізацыяй Бунда.

У гады рэакцыі і новага рэвалюц. ўздыму Гродна з'яўлялася адным з асн. пунктаў перасылкі нелегальнай парт. л-ры з-за мяжы ў Расію. У в. Ласосна (за 3 *км* ад Гродна) быў прыёмачны пункт л-ры, а ў горадзе — перадатачны і групы садзеяння распаўсюджванню паліт. л-ры. З 1909 у Гродне жылі прафесійныя экспедытары П. Лебіт і К. Я. Лебіт. Цераз Гродна ажыццяўляўся пераход парт. работнікаў за мяжу і з-за мяжы. Г. а. РСДРП трымала сувязь з ЦК РСДРП, мела бібліятэку нелегальнай л-ры. Дзейнасць Г. а. РСДРП асабліва актывізавалася летам 1912. Былі наладжаны сувязі з рэд. «Рабочей газеты» і «Звезды», якія шырока распаўсюджваліся ў Гродне. Рабочыя горада правялі стачку пратэсту супраць расстрэлу ленскіх рабочых, пасылалі сродкі ў фонд газ. «Правда», у Гродне існавала група праўдзістаў. Напярэдадні 1-й сусв. вайны рэвалюц. работу сярод салдатаў вяла Гродзенская група салдатаў сацыял-дэмакратаў. У 1-ю сусв. вайну Гродна акупавалі ням. войскі. Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі барацьба працоўных Гродна супраць ням. акупантаў узмацнілася. У горадзе дзейнічала камуністычнае падполле. Летам 1918 утварыўся Гродзенскі парт. камітэт, які ўзначаліў В. А. *Багуцкі*. Камітэт выдаваў газ. «Набат». Падпольшчыкі мелі

сувязі з бальшавіцкімі арг-цыямі Вільні, Мінска, Масквы, з ЦК і Паўн.-Зах. абласным к-там РКП(б). У кастр. 1918 у падпольнай арг-цыі было 102 чал. Пад яе кіраўніцтвам 8.1.1919 адбылася забастоўка і дэманстрацыя працоўных супраць ням. акупацыі. Быў створаны Савет рабочых дэпутатаў (103 дэлегаты, існаваў да 27.4.1919). У крас. 1919 Гродна акупавалі польскія войскі. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 Гродна адышло да Польшчы. Рэвалюц. барацьбу ўзначаліла Камуніст. рабочая партыя Польшчы (КПРП), з кастр. 1923 *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі* (КПЗБ).

Літ.: Гл. пры арт. *Гродзенская абласная партыйная арганізацыя.* *У. А. Нядзелька.* Гродна.

ГРОДЗЕНСКАЯ БАВОЎНАПРАДЗІЛЬНАЯ ФАБРЫКА, прадпрыемства лёгкай прамысловасці. Асн. прадукцыя: суравая баваўняная пража для трыкатажных і ткацкіх ф-к. Пабудавана ў 1963—67 (150 тыс. прадзільных і 17,3 тыс. круцільных верацён). У 1969 дасягнула праектнай магутнасці (11 250 *т*). Гал. цэхі: сартавальна-трапальны, часальны, стужкараўняльны, прадзільны, круцільна-маталь-ны. Пры ф-цы фельчарскі пункт аховы здароўя, 2 б-кі, дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Гродзенская вобласць.*


Ю. А. Шошын. Гродна.

ГРОДЗЕНСКАЯ БАРЫСАГЛЕБСКАЯ ЦАРКВА, гл. *Барысаглебская царква.*

ГРОДЗЕНСКАЯ ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП (Гродзенская сацыял-дэмакратычная ваенная арганізацыя), група сацыял-дэмакратаў, якая вяла рэвалюц. работу сярод салдатаў Гродзенскага гарнізона ў 1902—08. Мела сувязь з Гродзенскай і Віленскай арг-цыямі РСДРП. У 1906—07 дзейнічала пад кіраўніцтвам *Ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі пры Абласным саюзе РСДРП Літвы і Беларусі.* Стварала прапагандысцкія гурткі, «часцявыя сходы» (арг-цыі), якімі кіравала цераз цэнтр. сход (складаўся з прадстаўнікоў «часцявых сходаў»). Выдавала газ. *«Солдатская воля»*, адозвы. Наладжвала сходы, узначальвала рэв. выступленні салдатаў Гродзенскага гарнізона. У 1906 пад яе ўплывам было да 10 тыс. чал.

У выніку рэвалюц. прапаганды 5.11.1905 запасныя салдаты 1-й і 2-й батарэй 26-й артыл. брыгады адмовіліся падпарадкавацца камандзірам і патрабавалі: свабоды сходаў, скарачэння тэрміну службы, спынення муштру і вдзекі афіцэраў, не пасылаць салдатаў на разгром рэвалюц. выступленняў, скасаваць ваен. суды; калі патрабаванні не будуць задаволены, пагражалі ўзарваць парахавы склеп і перабіць начальства. Кіраваў выступленнем к-т (Матушэўскі, Міронаў, Смірноў, А. І. Шутовіч). Вялікі полк адмовіўся ўдзельнічаць у разгроме выступлення артылерыстаў. Г. в.-р. а. правіла мітынг салдатаў, выпусціла пракламацыю з іх патрабаваннямі. Камандаванне хлуслівa абяцала задаволіць патрабаванні, а калі хваляванні спыніліся, арыштавала 136 салдатаў, якіх саслалі на катаргу і ў дысцыплінарныя батальёны. У адказ на арышты 14.11.1905 Г. в.-р. а. склікала мітынг прадстаўнікоў вайск. часцей гарнізона. Рэвалюцыя мітынгу (выдадзена асобнай лістоўкай) выказвала пратэст супраць расправы над артылерыстамі, салідарнасць з паўстаннем матросаў Адэсы, Кранштата і Севастопаля, заклікала салдатаў далучыцца да рэвалюц. барацьбы рабочых. У сак. 1906 Г. в.-р. а. надрукавала пісьмо сасланых на катаргу артылерыстаў «Да салдатаў Гродзенскага гарнізона» і адозву «Да маладых салдатаў», у якіх ганьбавала царызм, заклікала да рэвалюцыі. У чэрв. 1906 кіравала выступленнем салдатаў Асавецкай крэпасці. Г. в.-р. а. спыніла дзейнасць з-за масавых рэпрэсій у перыяд рэакцыі.

Літ.: Гл. пры арт. *Гродзенская абласная партыйная арганізацыя.* *М. Я. Шкляр.* Мінск.



План Гродзенскай Верхняй царквы.


ГРОДЗЕНСКАЯ ВЕРХНЯЯ ЦАРКВА, помнік дойлідства 14 — пач. 15 ст. Выяўлена ў 1933 у час археал. раскопак на тэр. *Гродзенскага Старога замка.* Стаяла над Гродзенскай Ніжняй царквой. У 1939 перанесена ў асобны павільён. Г. В. ц. — невялікі, квадратны ў плане бесстаўповы цагляны храм з адной апсідай.

Літ.: Воронин Н. Н. Древнее Гродно, М., 1954.

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе БССР. Утворана 20.9.1944. На З рэспублікі, у бас. р. Нёман, каля дзярж. граніцы СССР з Польшчай. Пл. 25 тыс. км². Нас. 1120 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 17 раёнаў: Астравецкі, Ашмянскі, Бераставіцкі, Ваўкавыскі, Воранаўскі, Гродзенскі, Дзятлаўскі, Зэльвенскі, Іўеўскі, Карэліцкі, Лідскі, Мастоўскі, Навагрудскі, Свіслацкі, Слонімскі, Смаргонскі, Шчучынскі (гл. адпаведныя артыкулы); 9 гарадоў, 20 гар. пас., 3 рабочыя пасёлкі. Цэнтр — г. Гродна. (Карты і іл. гл. на ўкл.)

Прырода. Паверхня пераважна раўнінная. У цэнтр. частцы водналедавіковая Нёманская нізіна (85—150 *м* над узр. м.). На Пд і У марэнныя згладжаныя ўзвышшы — Гродзенскае, Ваўкавыскае, Слонімскае і Навагрудскае (да 323 *м*) — утвараюць паўд.-зах. галіну Беларускай грады. На Пн і ПнУ Лідская марэнная раўніна (да 170 *м*) і Ашмянскае ўзв. (да 320 *м*), частка Нарачана-Вілейскай нізіны. Карысныя выкапні: жал. руда, цагельныя, чарапічныя і цэментныя гліны, мергель і мел, сілікатныя пяскі, вапнякі, жвір. Запасы торфу (каля 2 млрд. м³) пераважна на Нёманскай нізіне. Клімат умерана цёплы, вільготны. Сярэдняя т-ра студз. ад −5, −5,5 °С на З і ПдЗ да −6, −6,5 °С у цэнтры і на ПдУ і −6,5, −7 °С на крайнім ПнУ (абс. мінімум −40 °С), ліп. 17,5—18,5 °С (абс. максімум 36 °С). Вегет. перыяд 188—200 дзён (на 10—15 дзён больш, чым на Пн БССР). Ападкаў 550—650 *мм*, на Навагрудскім узв. да 700 *мм* за год. Рэкі: Нёман з прытокамі (Вілія з Ашмянкай, Бярэзіна, Гаўя, Дзітва, Лебяда, Котра — справа; Уша, Сэрвач, Моўчадзь, Шчара, Зальвянка, Рось, Свіслач — злева), на Пд — Нараў (бас. Віслы). Азёраў мала; найбольшыя: Белае, Рыбніца, Свіцязь. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (64,4%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (12,5%), дзярнова-балотныя (10,8%), тарфяна-балотныя (7,1%), алювіяльныя (5%) і інш. З мінер. глебаў 59,3% супясчаных, 29,2 суглінкавых, 11,5% пясчаных. На З і ПдЗ вобласці на







Краявід паблізу вёскі Куравічы ў Навагрудскім раёне.

павышаных участках — сярэднепадзолістыя, суглінкавыя і супясчаныя, на Нёманскай нізіне сярэдне- і слабаападзоленыя пясчаныя і супясчаныя, па далінe Нёмана — тарфянабалотныя і алювіяльныя глебы. На Ашмянскім, Навагрудскім, Ваўкавыскім, Гродзенскім узвышшах, на Пн і ПнУ вобл. (Лідская раўніна, Нарачана-Вілейская нізіна) — моцна- і сярэднепадзолістыя суглінкавыя глебы. У Гродзенскім, Бераставіцкім, Ваўкавыскім р-нах значныя ўчасткі перагнойна-карбанатных глебаў. Г. в. у зоне мяшаных хваёва-шыракалістых лясоў, якія займаюць 30,8% тэр. Пераважае хвоя (65%), елка (11%), бяроза (10%), вольха (7%), асіна, дуб, радзей граб, клён. У межах вобласці Налібоцкая, Ліпічанская, паўн. ч. *Белавежскай пушчы.* Найб. лясістасць (40—54%) у Свіслацкім, Дзятлаўскім, Іўеўскім, Астравецкім, найменшая (10%) у Бераставіцкім і Зэльвенскім р-нах. Балоты, пераважна нізінныя (95,8%), займаюць 6,6% тэр. вобласці. Пад лугамі і пашай 16,4% тэр. Жывёльны свет — пераважна фаўна мяшаных і шыракалістых лясоў. 60 відаў млекакормячых і каля 220 відаў птушак. Найб. пашыраны лось, казуля, дзік, бабёр, заяц-русак, вавёрка, ласка, ліс. Прамысл. значэнне маюць таксама лясная куніца, выдра, чорны тхор, норка, гарнастай, барсук, янотападобны сабака, крот і інш. У Белавежскай пушчы водзяцца зубры, высакародныя алені, лані, акліматызуюцца фазаны. У рэках і азёрах карпавыя і акунёвыя рыбы, шчупак, зрэдку вусач і сом, у бас. Нёмана трапляецца харыус.

Насельніцтва. Паводле перапісу 1970 у вобласці жывуць: беларусы (65,1%), палякі (24,7%), рускія (7,7%), украінцы (1,5%) і інш. Гарадскога нас. 33%. Сярэдняя шчыльнасць 44,8 чал. на 1 *км²* (1970). Найб. густа населены (ацэнка, 1969) Шчучынскі (47,4 чал. на 1 *км²*), Карэліцкі (43,5 чал.), Ваўкавыскі (43,5 чал., без Ваўкавыска), Лідскі (40,4 чал., без Ліды) р-ны. Меншая шчыльн. у Астравецкім (23,2 чал. на 1 *км²*), Бераставіцкім (29 чал.), Свіслацкім (29,2 чал.) р-нах. Найб. гарады (тыс. ж., 1970): Гродна (132), Ліда (48), Слонім (30), Ваўкавыск (23,3), Навагрудак (19,4).

Гістарычны нарыс. Тэр. Г. в. заселена людзьмі з позняга палеаліту. Найб. стараж. стаянкі на воз. Свіцязь і Чарэшля (Навагрудскі р-н) належаць да *свідэрскай культуры.* У эпоху мезаліту на Папянонні жылі плямёны макраліта-мікралітычнай культуры — стаянкі Нясілавічы (Дзятлаўскі р-н), Збляны (Лідскі р-н), каля вусця р. Котры, у эпоху неаліту — плямёны *нёманскай культуры* (Бор, Гапчары ў Лідскім р-не, Янава, Русакова ў Слонімскім р-не, Ярэмічы ў Карэліцкім р-не і інш. паселішчы). У бронзавы век на тэр. вобласці праніклі плямёны *шнуравой керамікі культуры,* знаёмыя з земляробствам і жывёлагадоўляй; пазней склаліся плямёны сярэднебронзавай культуры. З Пд на насельніцтва Панямоння ўплывала *тшцінецкая культура* (Ніз, Слонімскі р-н, Мацеўчукі, Шчучынскі р-н). У ранні жалезны век (з 8 ст. да н. э.) на тэр. Г. в. жылі плямёны *штрыхаванай керамікі культуры,* а на З вобласці — насельніцтва, якое пакінула пахаванні ў каменных скрынях. Найб. вядомыя помнікі таго часу Гарнеты, Дакудава (Лідскі р-н), Гарадкі, Талькаўшчына (Слонімскі р-н), Дзям'янаўцы, Таўкуны (Дзятлаўскі р-н), Дубна, Навасёлкі (Мастоўскі р-н), Маруліны (Навагрудскі р-н), Селішча, Радагошча (Карэліцкі р-н). Тэр. вобласці насялялі *балты.* З 2-й пал. 1-га тысячагоддзя пачынаецца славянская каланізацыя. Тут жылі *дрыгавічы, яцвягі,* літва. У 10—11 ст. Гродзеншчына ў складзе Кіеўскай Русі. У 12 — 1-й пал. 14 ст. існавалі Гарадзенскае, Новагародскае і Ваўкавыскае княствы. Найб. гарады: Гродна (1128), Навагрудак (1212), Слонім (1251), Ваўкавыск (1252), Ліда (1380). З пач. 13 ст. тэр. Г. в. ў складзе Вял. кн. Літ. У 50—70-я г. 13 ст. галіцка-валынскія князі няраз ваявалі за Гродзеншчыну з літ. князямі. З 80-х г. 13 ст. да пач. 15 ст. на тэр. вобласці нападалі ням. рыцары. Ва ўмовах барацьбы супраць ням. агрэсіі ў замку Крэва (Смаргонскі р-н) заключана *Крэўская унія 1385* пра аб'яднанне Вял. кн. Літ. і Польшчы. Аднак мясцовыя феадалы на чале з гродзенскім кн. *Вітаўтам* выступілі супраць узмацнення ўплыву польскіх феадалаў і каталіцтва. Паміж Вітаўтам і Ягайлам на Гродзеншчыне адбываліся вазн. дзеянні, якія закончыліся *Астраўскім пагадненнем 1392.* Гродзенскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Навагрудскі і Слонімскі палкі (харугвы) удзельнічалі ў *Грунвальдскай бітве 1410.* Пасля *Гарадзельскай уніі 1413* Гродзенскае княства ўключана ў Троекае ваяводства, а Навагрудскае — у Віленскае. З 2-й пал. 16 ст. на тэр. Г. в. тры ваяводствы: Навагрудскае (Навагрудскі, Слонімскі і Ваўкавыскі пав.), Віленскае (Ашмянскі і Лідскі пав.) і Троекае (Гродзенскі пав.). Самакіраванне (магдэбургскае права) мелі Гродна з 1391, Навагрудак з 1511, Слонім з 1532, а таксама мястэчкі: Азёры, Свідаль, Масты, Пескі. Нац.-рэліг. прыгнёт асабліва ўзмацніўся пасля *Люблінскай уніі 1569* і *Брэсцкай уніі 1596. Брацтвы,* якія ўзніклі ў 17 ст. ў Гродне, Слоніме, Навагрудку, актыўна змагаліся супраць нац.-рэліг. ўціску. У 1655—57 тэр. Г. в. займалі рус. войскі цара Аляксея Міхайлавіча, у 1657—61 — шведскія. У Паўночную вайну 1700—21 Гродзеншчына няраз пераходзіла з рук у рукі. Насельніцтва памагала рус. арміі, партызаны дзейнічалі ў в. Зялёная Пушча, каля Смаргоні і інш. Войны зруйнавалі Гродна, Ашмяны, Ліду. Ажыўленне эканомікі пачалося толькі ў 2-й пал. 18 ст. Найбольшымі гаспадаркамі былі Гродзенская і Слонімская каралеўскія эканоміі. Расшыраліся гандл. сувязі з Расіяй, Польшчай, Прыбалтыкай. Узніклі мануфактуры (гл. *Гродзенскія каралеўскія мануфактуры*) па вырабе жалеза (мяст. Вішнева Ашмянскага пав.), дываноў, габеленаў і палатна (Карэлічы), сукна, шоўку, зброі (ваколіцы Гродна). У выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) тэр. вобласці далучана да Расіі і са снеж. 1795 у складзе Слонімскай і Віленскай губ., а з лют. 1797 — Літоўскай губ. Паводле ўказа ад 9.9. 1801 утворана *Гродзенская губерня.* У ліп.— снеж. 1812 тэр. вобласці акупавана франц. арміяй. Сляпне Гродзеншчыны памагалі рус. арміі, у в. Бершты Гродзенскага пав., Рудня, Мачульна, Чарапкі, Таламчаны, Рось, Пескі, Мсцібава, Свіслач Ваўкавыскага пав. дзейнічалі партыз. атрады. У 1825 афіцэры асобнага Літоўскага корпуса (Беластоцкі пав.) па ініцыятыве М. І. Рукевіча і з удзелам капітана К. Г. Ігельстрома стварылі т-ва *«Военныя*

сябры», якое мела сувязі з інтэлігенцыяй Гродна і вучнямі свіслацкай гімназіі. Шляхта Гродзеншчыны ўдзельнічала ў паўстанні 1830—31. У 40-п гады 19 ст. ў Гродне, Лідзе, Ашмянах, Навагрудку, Слоніме дзейнічалі групы тайнай арганізацыі *Братні саюз літоўскай моладзі*. У сувязі з рэформай 1861 сялянскія хваляванні ахапілі 85 маёнткаў Гродзенскай губ. Да пач. 1863 у губ. не было падпісана 90% устаўных грамат. Шырока разгарнулася на Гродзеншчыне паўстанне 1863 пад кіраўніцтвам К. *Каліноўскага*, які з крас. да чэрв. 1863 быў рэвалюц. камісарам губерні, а В. *Урублеўскі* ваен. кіраўніком паўстанцкіх атрадаў. У 2-й пал. 19 ст. на тэр. вобласці пракладзены чыг.: Пецярбургска-Варшаўская (1862), Віленска-Ровенская (1884), Баранавіцка-Беластоцкая (1886). Узніклі буйныя прамысл. прадпр.: тытунёвыя ў Гродне, Ваўкавыску, Лідзе, крышталю ў Лідскім пав., шоўкакруцільныя ў Слонімскім і Навагрудскім пав. У 1903—04 у Гродне, Слоніме, Лідзе, Смаргоні, Ашмянах узніклі групы РСДРП, дзейнасцю якіх кіраваў Паўночна-Заходні камітэт РСДРП (гл. *Гродзенская арганізацыя РСДРП, Ашмянская арганізацыя РСДРП, Смаргонская арганізацыя РСДРП, Лідская арганізацыя РСДРП*). Рэвалюц. прапаганду сярод салдатаў вяла *Гродзенская ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя РСДРП*. У рэвалюцыю 1905—07 стачкі і дэманстрацыі рабочых адбываліся амаль ва ўсіх гарадах і мястэчках. Сялянскі рух ахапіў усю губернію. У 1-ю сусв. вайну, у жн.— вер. 1915 тэр. вобласці акупавана немцамі. Многія нас. пункты спалены і разбураны.

На рэвалюц.-вызв. рух акупаванай Гродзеншчыны вялікі ўплыў зрабіла Кастр. рэвалюцыя. У канцы 1918 — пач. 1919 Чырв. Армія вызваліла ўсх. ч. Г. в. У Смаргоні, Ашмянах, Навагрудку, Слоніме, Лідзе ўзніклі Саветы. 27.4.1919 немцы перадалі Гродна польскім інтэрвентам, якія неўзабаве акупавалі ўсю тэр. вобласці. У ліп. 1920 Чырв. Армія зноў вызваліла Гродзеншчыну, але паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* яна далучана да бурж. Польшчы і ўваходзіла ў ваяводствы: Навагрудскае (Слонімскі, Шчучынскі, Навагрудскі і Лідскі пав.), Беластоцкае (Гродзенскі і Ваўкавыскі пав.) і Віленскае (Ашмянскі пав.). Прамысловасць амаль не развівалася. У 1921—24 тут разгарнуўся партыз. рух. Барацьбу працоўных за сац. і нац. вызваленне ўзначальвала КПЗБ. Дзейнічалі арг-цыі КСМЗБ, *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ), *Таварыства беларускай школы* (ТБШ). 17—20.9.1939 Гродзеншчына вызвалена Чырв. Арміяй. У 1939—44 Сапоцкінскі, Гродзенскі, Крынкаўскі (Бераставіцкі), Скідальскі, Ваўкавыскі і Свіслацкі р-ны ў складзе Беластоцкай вобл.; Мастоўскі, Зэльвенскі, Слонімскі, Каалоўшчынскі, Дзятлаўскі, Жалудоцкі, Шчучынскі, Навагрудскі, Валеўскі (Карэліцкі), Мірскі, Любчанскі, Іўеўскі, Юрацішкаўскі, Воранаўскі, Радунскі, Лідскі і Васілішкаўскі — Баранавіцкай вобл.; Ашмянскі, Астравецкі і Смаргонскі — Вілейскай вобл., Поразаўскі — Брэсцкай вобл. З першых дзён Вял. Айч. вайны Гродзеншчына стала арэнай жорсткіх баёў з нямфаш. захопнікамі. За 3 гады акупацыі (чэрв. 1941 — ліп. 1944) прычынены велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. На тэр. вобласці (у межах 1944) фашысты загубілі 176 530 чал., разрабавалі маёмасць усіх калгасаў, саўгасаў і МТС, зруйнавалі гарады і мястэчкі, спалілі сотні вёсак (гл. *Акупацыйны рэжым*). У час акупацыі ў Гродне, Скідалі, Слоніме, Лідзе, Ваўкавыску, Поразаве, Навагрудку дзейнічалі камуністычныя антыфашысцкія арг-цыі, на тэр. вобласці дзейнічалі тры падпольныя абкомы (Беластоцкі, Баранавіцкі і Вілейскі, гл. адпаведныя арт.), 22 райкомы, гарком КП(б)Б, падпольна выдавалася 19 газет — органаў РК КП(б)Б. Барацьбу з акупантамі ў вобласці вялі болей за 100 партыз. атрадаў, аб'яднаных у *Баранавіцкае партызанскае злучэнне, Беластоцкае партызанскае злучэнне* і *Вілейскае партызанскае злучэнне*. Сярод арганізатараў і кіраўнікоў партыз. і антыфашысцкага руху — П. П. *Капуста*, С. П. *Шупеня*, Я. Д. *Гапееў*, У. З. *Царук*, М. Т. *Анішчык*, Ф. М. *Сінічкін*, Я. А. *Прыданнікаў*, П. І. *Булак*. Пасля вызвалення Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў 20.9.1944 утворана Г. в. у складзе Бераставіцкага, Васілішкаўскага, Ваўкавыскага, Воранаўскага, Гродзенскага, Жалудоцкага, Зэльвенскага, Лідскага, Мастоўскага, Поразаўскага, Радунскага, Саноцкінскага, Свіслацкага, Скідальскага і Шчучынскага р-наў. Прамысловасць Гродзеншчыны адноўлена ў першыя пасляваенныя гады, у 1950 дала ўдвая больш прадукцыі, чым у 1940. Да 1952 у асноўным закончана калектывізацыя с. гасп. 8.1.1954 да Г. в. далучаны Дзятлаўскі, Казлоўшчынскі, Карэліцкі, Любчанскі, Мірскі, Навагрудскі, Слонімскі р-ны б. Баранавіцкай вобл., Іўеўскі б. Маладзечанскай вобл., у студз. 1960 Астравецкі, Ашмянскі, Смаргонскі і Юрацішкаўскі р-ны б. Маладзечанскай вобл. За мужнасць і гераізм у барацьбе з ням.-фаш. акупантамі і поспехі, дасягнутыя ў аднаўленні і развіцці пар. гасп., 1.8.1967 Г. в. узнаг. ордэнам Леніна.

Гаспадарка. Да ўз'яднання з Сав. Беларуссю Гродзеншчына была раёнам адсталай с. гасп. з буйным абшарніцкім землеўладаннем і дробнымі малазямельнымі і беззямельнымі сялянскімі гаспадаркамі. У прамысловасці пераважалі паўсаматужныя прадпрыемствы для нарыхтоўкі і перапрацоўкі мясцовай сыравіны. Каля $^9/_{10}$ валавой прадукцыі прамысловасці прыпадала на лёгкую і харч. галіны. За гады Сав. улады ў Г. в. створана буйная прамысловасць і механізаваная с. гасп. Валавая прадукцыя прамысловасці ў параўн. з 1940 выраслa ў 1965 у 12, у 1970 — у 22 разы (па рэспубліцы ў 12,5 раза). На долю вобл. прыпадае (1970) 35% цэменту, 67,4 кардону, 45,6 лакафарбавых вырабаў, 28,7 буд. вапны, 36,5 скуранога абутку, 23 фанеры, 19,7% цукру-пяску, якія вырабляюцца ў БССР (гл. табл. 1).

Прамысловасць. Пасля Вял. Айч. вайны ў вобласці створана машынабудаўнічая, металаапрацоўчая, хімічная прамысловасць. Вобласць уключана ў адзіную высакавольтавую сетку Беларусі. Электраэнергію дае таксама ЦЭЦ-2 у Гродне магутнасцю 120 тыс. *квт*. Найб. торфапрадпрыемствы: «40 гадоў БССР» (Лідскі р-н), «Райста» (Гродзенскі р-н), «Міранка» (Карэліцкі р-н), «Прусоўшчына» (Слонімскі р-н), «Валэйкавічы» (Смаргонскі р-н); торфабрыкетныя з-ды: «Верцялішкі» (Гродзенскі р-н), «Ашмянскі». Вял. значэнне ў паліўным балансе вобласці маюць прыродны газ, які ідзе на газаправоды з Дашавы, і кам. вугаль з УССР. Машынабудаванне і металаапрацоўка: *Лідскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Гродзенскі завод карданных валоў*, з-ды тэхнал. аснасткі, аўтаагрэгатаў, гандл. машынабудавання; «Электрапрылада», сантэхзагатовак (Гродна), ліцейнага абсталявання (Ваўкавыск), электравырабаў (Ліда), «Газаапарат» (Навагрудак); «Аўтапровад» (Шчучын), аўтарамонтныя з-ды (Ліда, Слонім) і інш. У хім. прамысловасці да 1963 пераважалі невялікія прадпрыемствы, якія выпускалі шкіпінар, воцатны кальцый, фарбы, сургуч, гуталін і інш. У 1963 пачаў дзейнічаць *Гродзенскі хімічны камбінат*, у 1965 Лідскі лакафарбавы з-д. На базе мясцовай сыравіны працуюць прадпрыемствы прамысловасці буд. матэрыялаў. Па вытворчасці цэменту *(Ваўкавыскі цэментны завод)* вобласць займае 2-е месца ў рэспубліцы. Выраб цэглы, вапны, чарапіцы, кафлі і інш. Выпускаюцца зборныя жалезабетонныя і бетонныя канструкцыі і дэталі: з-ды зборнага жалезабетону, жалезабетонных вырабаў і жалезабетонных канструкцый у Гродне, камбінат сілікатна-бетонных вырабаў у Смаргоні, камбінаты буд. матэрыялаў і домабудаўнічы ў Гродне. Прадпрыемствы дрэваапр. прамысловасці выпускаюць піламатэрыялы, фанеру, кардон, буд. дэталі і драўляную тару. Найбольшыя: Мастоўскі фанера-дрэваапр. і Гродзенскі дрэваапр. камбінаты, мэблевыя ф-кі (Гродна, Слонім, Масты), кардонныя ф-кі «Беларусь» (Слонімскі р-н) і «Альхоўка» (Астравецкі р-н), лесазавод «Смаргонь». На мясцовай і прывазной сыравіне развіваюцца гарбарна-абутковая, тэкстыльная, швейная прамысловасць. Прадпрыемствы: *Гродзенская абутковая фабрыка* і гарбарны з-д у Гродне, абутковая ф-ка ў Лідзе, *Гродзенская бавоўнапрадзільная фабрыка, Гродзенскі тонкасуконны камбінат*, 3 ільнозаводы — у Ашмянах, Слоніме, Дзятлаўскім р-не (Дварэц), швейныя ф-кі ў Гродне, Навагрудку. Вядомы *шклозавод «Нёман»* (Лідскі р-н), які выпускае высакаякасны сартавы посуд, і шклозавод у Гродне. Харч. прамысловасць па аб'ёме валавой прадукцыі займае 1-е месца ў вобласці (40%). 5 мясакамбінатаў (Гродна, Ліда, Слонім, Ваўкавыск, Ашмяны), малочна-кансервавы камбінат у Лідзе, камбінат дзіцячых малочных прадуктаў у Ваўкавыску, гарадскі малочны з-д у Гродне, 10 масласыраводаў. У 1950 пачаў дзейнічаць Скідальскі цукр. з-д. Важныя прадпрыемствы харч. прамысловасці — Гродзенская тытунёвая ф-ка «Нёман», Лідскі камбінат харч. канцэнтратаў. Перапрацоўваюць бульбу 17 спіртавых і 4 крухмальныя з-ды. 4 агародніна-сушыльныя і 3 плодаагародніна-кансервавыя, 3 вінаробныя (Гродна, Слонім, Дзятлава), 3 піваварныя (Гродна, Ліда, Навагрудак), дражджавы (Ашмяны), рыбакансервавы (Гродна) з-ды.

Табліца 1

Вытворчасць найважнейшых відаў прамысловай прадукцыі Гродзенскай вобласці

Віды прадукцыі	1940	1945	1965	1970
Торф паліўны, тыс. *т*	78	43	573	1046
Бульбаўборачныя машыны, тыс. шт.	—	—	12,8	21,2
Кардон, тыс. *т*	5,0	–	31,1	36,6
Цэмент, тыс. *т*	108,5	50,2	638,2	671,6
Тканіны шарсцяныя, тыс. *м*	43	—	2404	2509
Абутак скураны, млн. пар	0,2	0,0	9,3	13,7
Цукар-пясок, тыс. *т*	—	—	40,4	35,6
Мяса (разам з субпрадуктамі 1-й катэгорыі), тыс. *т*	7,0	1,6	33,3	70,3
Масла, тыс. *т*	0,5	0,4	8,0	8,1

Сельская гаспадарка. На канец 1970 у вобл. было 400 калгасаў і 92 саўгасы. У 1970 у с. гасп. выкарыстоўвалася 12 704 трактары, 3884 збожжаўборачныя камбайны, 8240 грузавых аўтамабіляў (разам з аўтацыстэрнамі). Пад с.-г. ўгоддзямі 51% тэр., у т. л. пад worнымі землямі 34,1%, сенажацямі 5,8, пашаю 7,5%. На канец 1970 асушана 158,8 тыс. *га* балотаў і забалочаных зямель, з іх пад с.-г. ўгоддзямі 136,8 тыс. *га* (у т. л. на тарфяніках 59,0 тыс. *га*). У 1970 пасяўныя плошчы ў вобласці павялічыліся ў параўнанні з 1940 на 106,2 тыс. *га* (гл. табл. 2) і палепшылася іх структура.

Табліца 2


Структура пасяўных плошчаў Гродзенскай вобл. (у % ад усёй пасяўной плошчы)

Культуры	1940	1945	1960	1965	1970
Збожжавыя	74,0	75,4	49,3	51,1	39,3
Тэхнічныя	3,3	2,6	6,5	7,0	5,9
Агародніна	1,2	1,0	0,7	0,7	0,7
Бульба	14,6	15,8	17,0	15,1	14,8
Кармавыя	6,9	5,2	26,5	26,1	39,3

Пасяўная плошча ўсіх с.-г. культур (тыс. *га*, 1970) 867,9, у т. л. пад збожжавымі і зер-

На свінаферме ў саўгасе «Пераможац» Слонімскага раёна.





На палях калгаса імя Жданава Гродзенскага раёна.

небабовымі 341,1, тэхнічнымі 50,8, бульбай 128,8, агароднінай 5,6, кармавымі культурамі 341,3. Асн. збожжавыя культуры — жыта (115,9 тыс. *га*), ячмень (103,2 тыс. *га*), пшаніца (51,3 тыс. *га*), авёс (35,2 тыс. *га*); з тэхн.— лён (36,4 тыс. *га*), цукр. буракі фабрычныя (13,0 тыс. *га*). Пад садамі і ягаднікамі 20,3 тыс. *га*. Пасевы збожжавых і зернебабовых, бульбы і кармавых культур размешчаны ў вобласці амаль раўнамерна. Лён сеюць на ПінУ вобласці (на Іўеўскі, Карэліцкі, Навагрудскі, Астравецкі, Ашмянскі і Смаргонскі р-ны прыпадае 56,1% пасеваў вобласці), цукр. буракі (фабрычныя) — на З вобласці (на Бераставіцкі, Гродзенскі, Шчучынскі, Мастоўскі і Ваўкавыскі р-ны — 62% усіх пасеваў). Адзіны ў рэспубліцы спецыялізаваны саўгас «Вялікае Мажэйкава» (Шчучынскі р-н) вырошчвае лекавыя травы. Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. (Пра змены пагалоўя жывёлы ў вобласці гл. табл. 3.)

Табліца 3

Пагалоўе жывёлы ва ўсіх гаспадарках Гродзенскай вобл.
(тыс. галоў, на канец года)

	1940	1945	1960	1965	1970
Буйная рагатая жывёла	415,3	312,8	552,8	663,8	814,9
у т. л. каровы	319,4	218,1	307,8	334,6	366,8
Свінні	408,7	199,0	491,3	511,2	628,1
Авечкі	463,8	226,0	196,9	121,4	92,3

Транспарт. Асн. від транспарту — чыгункі; даўж. 666 *км* (1969). Гал. лініі: Мінск — Маладзечна — Смаргонь — Вільнюс, Вільнюс — Ліда — Баранавічы — Луніпец, Маладзечна — Ліда — Гродна — Беласток, Гродна — Ваўкавыск — Баранавічы. Вялікія чыг. вузлы Ліда, Гродна і Ваўкавыск. Даўж. аўтамаб. дарог з цвёрдым пакрыццём 5,4 тыс. *км* (1969). Гал. магістралі: Мінск — Ліда — Гродна, Гродна — Вільнюс, Мінск — Вільнюс, Баранавічы — Ваўкавыск — Гродна, Баранавічы — Вільнюс. Суднаходства па Нёмане і Шчары. На тэр. вобласці праходзяць адгалінаванні газаправода Дашава — Мінск; Івацэвічы — Ліда — Вільнюс; Івацэвічы — Ваўкавыск — Гродна. Гродна злучана авіялініямі з Мінскам, Брэстам, Навагрудкам, Ашмянамі і інш. гарадамі.

Ахова здароўя. У 1913 на тэр. Г. в. было 1127 бальнічных ложкаў, 214 урачоў. У 1940—75 бальніц на 2614 ложкаў (20,5 на 10 тыс. нас.), 519 урачоў (4,1 на 10 тыс. нас.), 1525 чал. сярэдняга мед. персаналу (12 на 10 тыс. нас.). На пач. 1970 было 159 бальнічных устаноў на 11 870 ложкаў (105,9 на 10 тыс. нас.), 194 амбулаторна-паліклінічныя ўстановы, у т. л. 29 дыспансераў, 6 санаторыяў на 1175 ложкаў, 2 дамы адпачынку на 430 ложкаў, 2371 урач (21,2 на 10 тыс. нас.), у т. л. 286 зубных, 8072 чал. сярэдніх мед. работнікаў (72 на 10 тыс. нас.).

Культура. Да 1939 у Г. в. не было ВНУ і бел. школ. У 1970/71 навуч. г. працавала 221 дашкольная дзіцячая ўстанова (на 21 143 дзіцяці), 1591 агульнаадук. школа ўсіх відаў (227,4 тыс. навучэнцаў); у т. л. 270 сярэдніх і 445 васьмігадовых; 12 прафесійна-тэхн. вучылішчаў (7049 чал.); 17 сярэдніх спец. навуч. устаноў (17 576 чал.); 3 ВНУ: *Гродзенскі медыцынскі інстытут, Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, Гродзенскі педагагічны інстытут* (ва ўсіх ВНУ 8618 студэнтаў). На 1.1. 1970 было 1083 масавыя б-кі (7720 тыс. экз.); 813 клубных устаноў, у т. л. 120 Дамоў культуры, 1299 кінаўстановак, 7 музеяў (*Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Дзятлаўскі музей народнай славы, Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей, Міцкевіча Адама Дом-музей*; Ашмянскі, Лідскі, Слонімскі краязнаўчыя).

Выдаецца 19 газет, у т. л. абласная *«Гродненская правда»* (тыраж 85 тыс. экз.), 1 аб'яднаная, 16 раённых і 1 шматтыражная (агульны тыраж 113,5 тыс. экз.). Пры клубных установах 2850 гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці (44 тыс. удзельнікаў), у т. л. Слонімскі, Лідскі, Гродзенскі, Ашмянскі народныя тэатры, Бараўскі народны хор, Дзяляцкая харавая капэла, ансамблі песні і танца «Нёман» у Гродне, імя Агінскага ў Смаргоні, «Лідчанка» ў Лідзе, танцавальны калектыў Палаца культуры тэкстыльшчыкаў у Гродне, нар. цырк у Навагрудку, Смаргонскі цымбальны аркестр.

Літ.: География Белоруссии, Мн., 1965; Гладкий В. И. и др. Экономическая география БССР, Мн., 1967; Белорусская ССР. Гродненская область, Мн., 1968; Гурина Н. Н. Новые данные о каменном веке Северо-Западной Белоруссии, у кн.: Палеолит и неолит СССР, т. 5, М.—Л., 1965 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 131); Чернявский М. М. Неолит Белорусского Понеманья, у кн.: Тезисы докладов к конференции по археологии Белоруссии, Мн., 1969; Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья, М.—Л., 1962; Бобровский П. О. Материалы для географии и статистики России... Гродненская губерния, ч. 1—2, СПб., 1863; Солоневич Л. (сост.). Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет ее существования. 1802—1902, Гродно, 1901; Военно-статистическое обозрение Российской империи, т. 9, ч. 3 — Гродненская губерния, СПб., 1849; Орловский Е. Гродненская старина, ч. 1, Гродно, 1910; Ягож. Гродненская губерния в 1812 году, Гродно, 1912; Мараш Я. Н. и Соболь Н. И. Борьба трудящихся Гродненщины за Советскую власть (1918—1939 гг.), Гродно, 1958; Белоруссия, М., 1967 (Советский Союз); Белорусская ССР за 50 лет. Статистический сб., Мн., 1968. *В. А. Дзяменцьеў* (прырода, насельніцтва), *М. Т. Раманоўскі* (гаспадарка), *М. В. Віч* (гістар. нарыс), *М. М. Чарняўскі* (археалогія). Мінск; *А. І. Ульяновіч* (культура). Гродна.


ГРОДЗЕНСКАЯ ГУБЕРНЯ, адм.-тэр. адзінка ў 1801—1920. Утворана паводле ўказа Аляксандра I ад 9.9.1801 замест скасаванай *Літоўскай губерні.*

Уключала 8 пав.: Брэсцкі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Кобрынскі, Лідскі, Навагрудскі, Пружанскі і Слонімскі. Паводле ўказа ад 18.12.1842 «Пра пераўтварэнне паўн.-зах. губерняў» у склад Г. г. дадаткова ўключаны Беластоцкі, Бельскі і Сакольскі пав. з Беластоцкай вобласці, а з Г. г. перададзены Мінскай губерні Навагрудскі пав., Віленскай губерні — Лідскі пав. Губернскі горад — Гродна. Насельніцтва 1 617 859 чал. (1897). Спыніла існаванне ў 1920 у сувязі з акупацыяй бурж. Польшчай. У 1921—39 тэр. Г. г. уваходзіла ў Беластоцкае ваяводства, *Палескае ваяводства* і *Навагрудскае ваяводства.*

Літ.: Солоневич Л. (сост.). Краткий исторический очерк Гродненской губернии..., Гродно, 1901; Бобровский П. О. Материалы для географии и статистики России... Гродненская губерния, ч. 1—2, СПб., 1863; Военно-статистическое обозрение Российской империи, т. 9, ч. 3 — Гродненская губерния, СПб., 1849; Белорусская ССР. Гродненская область, Мн., 1968.

ГРОДЗЕНСКАЯ НІЖНЯЯ ЦАРКВА, помнік старажытнарускага дойлідства 2-й чвэрці 12 ст. Пабудавана майстрамі гродзенскай школы дойлідства. У 1183 царкву папсаваў пажар, і да сярэдзіны 13 ст. яна разбурылася. Руіны яе знойдзены ў цэнтры *Гродзенскага Старога замка* ў час археал. раскопак 1931—37.





Фрагмент маёлікавай падлогі (рэканструкцыя) і план Гродзенскай НІжняй царквы.

Царква — шасціслаўповы крыжовакупальны трохапсідны храм (бакавыя апсіды размешчаны ў тоўшчы зах. сцяны). Прамавугольны план храма і рэшткі сцен даюць магчымасць меркаваць, што гэта быў цэласны аб'ём, завершаны купаламі, а фасадамі, расчлянёнымі шырокімі лапаткамі са скругленымі вуглами. У верхніх частках фасадаў былі вузкія арачныя вокны. У паўд.-зах. куце — усходы, што вялі на хоры. Каб палегчыць канструкцыю, у сцены і скляпенні ўмуроўваліся збаны-галаснікі. Сцены муравалі з плоскай цэглы — плінфы і абчасаных, паліраваных валуноў. Фасады аздабляліся каляровымі паліванымі керамічнымі ўстаўкамі. Высокамастацкая ўзорыстая маёлікавая падлога выкладзена жоўтымі, зялёнымі і карычневымі плітамі.

Літ.: Воронин Н. Н. Древнее Гродно, М., 1954 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 41). *У. А. Чантурыя.* Мінск.

ГРОДЗЕНСКАЯ ШКОЛА ДОЙЛІДСТВА, самабытная архітэктурная школа, якая склалася ў 12 ст. ў Гродне. Будынкі Г. ш. д. вызначаюцца арыгінальнымі сродкамі маст. выразнасці: сістэма арх. ўпрыгожання фасадаў і сцен прадугледжвала выкарыстанне ў цаглянай муроўцы дэкар. уласціваснай каменя (паліраваныя і гранёныя валуны) і маёлікі (устаўкі з чырвоных, жоўтых і зялёных плітак), дэкар. паліваных галаснікоў у сценах, наборнай узорыстай маёлікавай падлогі і г. д. (гл. *Гродзенская Ніжняя царква, Барысаглебская царква*).

ГРОДЗЕНСКАЯ ЭКАНОМІЯ, феад. каралеўская гаспадарка ў Вял. кн. Літ. 16—18 ст. Створана ў 1589 з дзярж., т. зв. сталовых маёнткаў, даходы якіх ішлі на ўтрыманне каралеўскага і вялікакняскага двароў.

Да сярэдзіны 18 ст. дзялілася на ключы, войтаўствы і вёскі, з 2-й пал. 18 ст.— на «губерні» (Яноўская, Дамброўская, Сакольская, Крынкаўская, Квасаўская і Азёрская), у склад якіх (на 1783) уваходзілі 49 ключоў, 24 фальваркі, 1 лентвойтаўства, 13 гарадоў і мястэчак, 368 вёсак, 5 пушчаў (Сакольска-Навадворская, Пярстунска-Пераломская, Стрыеўска-Бярштанская, Белавежская і Жувынцка-Аліцкая), мела 7294 валокі зямлі (больш за 155 тыс. *га*), 10 580 гаспадарак, 42 380 чал. Сялянскія гасп. складалі 89,8%, амаль усе цаглыя, невялікая частка — свабодныя ад павінны. Становішча сялян эканоміі было крыху лепшае, чым у магнацкіх і царкоўных уладаннях. Г. э. прычынены вял. страты ў час вызв. вайны ўкр. і бел. народаў (1648—54), польска-швед. Паўночнай войнаў (1700—21), у час эпідэмій. У 2-й пал. 18 ст. гаспадарка адноўлена. Рэформы літ. падскарбія А. Тызенгаўза ў 70-я г. 18 ст. выклікалі ўзмацненне феад. эксплуатацыі сялян. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай уладанні Г. э. падараваны, часткова прададзены прыватным асобам. Гл. таксама *Эканомія.*

Кр.: Писцовая книга Гродненской экономии, ч. 1—2, Вильна, 1881—82.

Літ.: Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI—XVIII вв., Львов, 1957; Ягож. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй пол. XVIII в., Вильнюс, 1966. *Я. Н. Мараш.* Гродна.

ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР. Створаны на базе пераведзенага ў Гродна *Бабруйскага абласнога рускага драматычнага тэатра.* Адкрыўся 20.10.1947 спектаклем «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага. Арганізатар т-ра і першы маст. кіраўнік М. *Кавязін.* У розны час працавалі: рэжысёры засл. дзеяч мастацтваў БССР Ю. *Арыянскі* і А. *Міронскі*, нар. арт. БССР І. *Папоў*; засл. артысты БССР М. Астанкава, Г. Глінаецкі, С. Іванова, М. Кавязіна, Л. Сторажава, П. Філіпаў. У рэпертуары пераважна сучасныя п'есы. У складзе трупы (1971): нар. арт. БССР Я. Кімберг, засл. артысты БССР С. Аляксандраў, А. Бірычэўскі, В. Грачынскі, Г. Панкрат, А. Цароў; артысты Р. Адзіс, У. Дзёмін, І. Дзеніскевіч, Л. Ашуркава, С. Кліменка, Л. Колікава, Н. Нячаева, Т. Нікалаева і інш. Гал. рэж. (з 1963) засл. дз. маст. РСФСР А. Струнін, гал. мастак М. Якунін, мастак М. Апёк. У 1967 т-р гастраляваў у Беластоку (Польшча).

Центральная научная библиотека Академии наук Узбекской ССР
416811



Сцэна з спектакля «Год вдзяйсненняў» П. Васілеўскага ў Гродзенскім абл. драм. т-ры.

АСНОЎНЫЯ СПЕКТАКЛІ

1948 — «Вялікая сіла» В. Рамашова, «Вострaў міру» Я. Пятрова, «Мінулася кату масленіца» А. Астроўскага, «Маскоўскі характар» А. Сафронава, «Вас выклікае Таймыр» К. Ісаева і А. Галіча, «Авадзень» паводле Э. Л. Войніч, «Шальменка-дзяпшчык» Р. Квіткі-Аснаўяненкі, «Дзеці Ванюшына» С. Найдзёнава. 1949 — «Шчасце» паводле П. Паўленкі, «Чужы пень» К. Сіманава, «Абрыў» паводле І. Ганчарова, «Ноч памылак» О. Голдсміта, «Слуга двух гаспадароў» К. Гальдоні, «Свае людзі — паладзім» Астроўскага. 1950 — «Машачка» А. Афінагенава, «На тым баку» А. Баранава, «На дне» М. Горкага, «За другім фронтам» В. Сабко, «Калі зацвітаюць сады» В. Палескага, «Даходнае месца» Астроўскага. 1951 — «Прага застаецца маёй» Ю. Буракоўскага, «Васа Жалязнова» М. Горкага, «Дырэктар» С. Алёшына, «Позняе каханне» і «Ваўкі і авечкі» Астроўскага, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі. 1952 — «Апошнія» М. Горкага, «Жаніцьба» М. Гогаля, «Вяселле з пасагам» М. Дзьяканава, «Макар Дубрава» А. Карнейчука, «Свеціць, ды не грэе» Астроўскага і М. Салаўёва, «Пад залатым арлом» Я. Галана, «Напярэдадні» паводле І. Тургенева, «Гэта было ў Мінску» А. Кучара, «Шынкарка» Гальдоні. 1953 — «Таня» А. Арбузава, «Анёл-ахоўнік з Небраскі» А. Якабсана, «Зямны рай» О. Васілева, «Лес» Астроўскага, «Каменны валадар» Л. Украінкі, «Дзяўчаты-красуні» А. Сімукова. 1954 — «Марыя Цюдар» В. Гюго, «Валенсійская ўдава» Лопэ дэ Вэгі, «Яўгенія Грандэ» паводле А. Бальзака, «У бязавым садзе» Ц. Саладара, «Дом» на ўскраіне» Арбузава, «Іван Рыбакоў» В. Гусева, «Чужое дзіця» В. Шкваркіна. 1955 — «Гісторыя аднаго кахання» Сіманава, «Сэрца не даруе» Сафронава, «Іспанцы» М. Лермантава, «Нявольніцы» Астроўскага, «Слава» Гусева, «Грак — птушка вясновая» С. Мсціслаўскага, «У добры час!» В. Розава, «Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай, «Дзень цудоўных падманаў» Р. Шэрыдана. 1956 — «Дачнікі» М. Горкага, «У ціхім завулку» А. Маўзона, «Мачаха» Бальзака, «Доктар» В. Нушыча, «Адна» Алёшына, «Дрэвы паміраюць стоячы» А. Касоны. 1957 — «Калі цвіце акацыя» М. Віннікава, «Каханне, дырэктар і кватэра» Саладара, «Адна ноч» Б. Гарбатава, «Глыбокая разведка» А. Крона, «Апошні прыпынак» Э. М. Рэмарка, «Год здзяйснення» П. Васілеўскага. 1958 — «Дэдлок» А. Талстога, «Далі неаглядныя» М. Вірты, «Чаму ўсміхаліся зоркі» Карнейчука, «Кахаю, кахаю» У. Мамонава. 1959 — «Чайкі над морам» Л. Бондарэвай, «Юстына» Х. Вуалівёкі, «Улада цемры» Л. Талстога, «Два колеры» А. Зака і І. Кузняцова, «Вясновыя скрыпкі» А. Штэйна. 1960 — «Дзеля сваіх блізкіх» В. Лаўрэнцьева, «Якарная плошча» І. Штока, «Мільён за ўсмешку» Сафронава, «Тры таварышы» паводле Рэмарка, «Валынщык з Страсбурга» І. Тыла, «Тры сястры» А. Чэхава, «Чужы дом» М. Зарудная. 1961 — «Тапаз» М. Паньёля і П. Нівуа, «У сябе ў палоне» М. Смірновай і М. Крайндзель, «Без віны вінаватыя» Астроўскага, «Салдаты» В. Шаўрына, «Страчаны сын» Арбузава, «Жыццё і злачынства Антона Шэлестава» паводле Р. Мядынскага. 1962 — «Справа не жыцця» А. Гутковіча і Ф. Казоўскай, «Тысяча франкаў узнагароды» Гюго, «Слёзы і гады» Л. Зорына, «Факір на гадзіну» У. Дыхавічнага і М. Слабадскога, «Жонка Клода» А. Дзюма-сына, «Гульня без правілаў» Л. Шэйніна. 1963 — «Перад вячэрай» Розава, «Палата» Алёшына, «Пяць вечароў» А. Валодзіна, «Вядомы 702-і» А. Мірадана, «Порт-Артур» паводле А. Сцяпанава. 1964 — «Святло далёкай зоркі» паводле А. Чакоўскага, «Антоній і Клеапатра» У. Шэкспіра, «Мілы лгун» Дж. Кілці, «Простая рэч» паводле Б. Лаўранёва, «Шануй бацьку свайго» Лаўрэнцьева, «Дамы і гусары» А. Фрэдры. 1965 — «Лепш астацься мёртвым» К. Ветлінгера, «Трывожнае шчасце» К. Фіна, «Дачка Расіі» П. Чараднічэнкі, «Лінія жыцця» М. Гарулёва, «Перабежчык» А. і П. Тур, «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна. 1966 — «Варвары» М. Горкага, «Паміж ліўнямі» Штэйна, «Венская паштовая марка» А. Лійвеса, «Самая кароткая ноч» Р. Назарава, «Цвыркун» Т. Кажушніка, «Змцаваныя крыўёю» Гарулёва, «Вышэйшая мера» Э. Каўгвера. 1967 — «Вясельнае падарожжа» Дыхавічнага, «Алека Дундзіч» М. Каца і А. Ржашэўскага, «104 старонкі пра каханне» Э. Радзінскага, «Цяжкае абвінавачанне» Шэйніна, «Платон Крэчат» Карнейчука, «Дыпламат» Алёшына, «Першы ўрок» К. Губарэвіча. 1968 — «Аплата» і «Я прысягаў Радзіме» А. Струніна, «Званок у пустую кватэру» Дз. Угрумава, «Захавай маю тайну» Сабко, «Раскінулася мора шырока» У. Азарава, У. Вішнеўскага і А. Крона. 1969 — «Чалавек і глобус» Лаўрэнцьева, «Крымінальнае танга» Э. Ранета, «Панна Малічэўская» Запольскай, «Вогненны мост» Б. Рамашова, «Прынцэса Турандот» К. Гоцы. 1970 — «Чорныя ружы» С. Джамала, «Маё сэрца з табою» Ю. Чапурына, «Аднойчы ў навагоднюю ноч» Э. Брагінскага і Э. Разанава, «Акіян» Штэйна, «Адкуль грэх?» А. Петрашкевіча. *А. А. Лабовіч.* Мінск.

ГРОДЗЕНСКІ АЗОТНАТУКАВЫ ЗАВОД, прадпрыемства хімічнай прамысловасці. З 1970 уваходзіць у склад *Гродзенскага хімічнага камбіната* (з 1971 імя С. В. Прытыцкага).

ГРОДЗЕНСКІ АРХЕАЛАГІЧНЫ КАМІТЭТ (*царкоўна-археалагічны камітэт*), установа, якая збірала, вывучала, ахоўвала і папулярызавала пісьмовыя помнікі і помнікі матэрыяльнай культуры на тэр. Гродзенскай губ. Створаны 26.11(9.12).1904, статут зацверджаны ў 1905. Г. а. к. стварыў музей («сховішча старажытнасцей»), які з 1907 размяшчаўся ў памяшканні Барысаглебскага манастыра. Справаздачы пра дзейнасць к-та рэгулярна друкаваліся ў «Гродненских епархиальных ведомостях». Перастаў існаваць у 1915 у сувязі з акупацыяй тэр. губерні кайзераўскімі войскамі.

Літ.: Орловский Е. Гродненская старина, ч. 1, Гродно, 1910, с. 333—334.

ГРОДЗЕНСКІ БЕРНАРДЗІНСКІ КАСЦЁЛ І МАНАСТЫР, архітэктурны комплекс 16—18 ст. Заложаны ў Гродне Зыгмунтам III Вазам на месцы каралеўскай стайні. Будаваўся ў 1595—1618, дабудоўваўся да сярэдзіны 18 ст.

Манастырскія карпусы, касцёл (трохнефавая шасцістаўповая базіліка) і шмат'ярусная званіца (на захадзе) прылягаюць адзін да аднаго і ўтвараюць замкнёны дворык. У кампазіцыю касцёла ўвайшлі элементы готыкі (контрфорсы, высокія стральчатыя праёмы на заднім і бакавых фасадах), рэнесансу (плоскаснае вырашэнне сцяны з ледзь акрэсленымі пілястрамі, тонкае абрамленне вокнаў гал. фасада), барока (крывалінейныя абрысы верхняга яруса гал. фасада, нішы са скульптурай, дынамічная групоўка ордэра). Два верхнія ярусы званіцы (завершана складаным шлемам) і афармленне інтэр'ера касцёла (1788, маст. А. Грушэцкі і Ф. Міхалкевіч) створаны ў стылі позняга, т. зв. «віленскага барока».


Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969.

ГРОДЗЕНСКІ БРЫГІЦКІ КАСЦЁЛ І МАНАСТЫР, архітэктурны ансамбль барока. Пабудаваны ў 1634—42.

Складаўся з жылых карпусоў (келлі, трапезная, б-ка і інш.), касцёла, пастаўленага на перакрыжаванні дарог, і званіцы-кампанілы (не захавалася). Абнесены 5-метровай тоўстай сцяной з васьмігранными вежамі па вуглах (макаўкі перабудаваны) і дзвюма прыгожа дэкарыраванымі брамамі: праезджай і пешаходнай. Дзверы скляпеністых памяшканняў выходзілі ў светлыя калідоры, якія абкружалі ўнутраны квадратны двор. У процівагу аскетычнаму абліччу жылых карпусоў фасад касцёла быў багата дэкарыраваны: яго расчляняюць пучкі карынфскіх пілястраў і ўпрыгожваюць разныя атыкі з невялікім франтонам, дзве дэкар. вежачкі, валюты. У дварэ манастыра захавалася гасп. і жылая пабудова — лямус (17—18 ст.).

Літ.: Гл. пры арт. *Гродзенскі бернардзінскі касцёл і манастыр.*






Агульны выгляд касцёла і план Гродзенскага бернардзінскага манастыра.

ГРОДЗЕНСКІ ГІСТОРЫКА-АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ, засн. ў 1920 па ініцыятыве археолага і краязнаўца Ю. *Ядкоўскага*. Адкрыты 9.12.1922. Размяшчаецца ў *Гродзенскім Старым замку*. У Айч. вайну разрабаваны нямецкімі акупантамі. Адноўлены ў 1945.


У 20 залах (пл. 1800 м²) і фондах музея больш за 100 тыс. экспанатаў (1971); фонд б-кі музея перавышае 25 тыс. кніг. Аддзелы: гісторыі дасав. і сав. перыядаў, прырода. У аддзеле гісторыі дасав. перыяду археал. матэрыялы з раскопак Замкавай гары ў Гродне, Ваўкавыскага, Індурскага і Турэйскага гарадзішчаў 11—12 ст., калекцыі манет 16—17 ст., зброі 14—19 ст., макеты Гродна 12, 14—16 ст., рукапісныя граматы 16—18 ст., друкаваныя кнігі 17—18 ст., выдадзеныя ў Гродне, калекцыя афіш Першага прафесійнага бел. тэатра І. Буйніцкага, багаты этнагр. матэрыял 17—19 ст., у т. л. ўзоры ткацтва, вышыўкі, разьбы па дрэве.



Будынак Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея (Гродзенскі Стары замак).

Адлюстраваны падзеі паўстання 1863—64 на чале з К. Каліноўскім і В. Урублеўскім, рэвалюц. рух на Гродзеншчыне ў канцы 19 — пач. 20 ст., у т. л. дзейнасць *Гродзенскай арганізацыі РСДРП, Гродзенскай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі РСДРП*. Спец. стэнды прысвечаны Ф. *Багушэвічу*, А. *Міцкевічу* і Э. *Ажэшцы*. У аддзеле гісторыі сав. перыяду матэрыялы пра Кастр. рэвалюцыю і грамадз. вайну, пра барацьбу працоўных на чале з КПЗБ за сац. і нац. вызваленне, за ўз'яднанне з БССР. Сярод экспанатаў дакументы, асабістыя рэчы, фотаздымкі членаў першых рэўкомаў, удзельнікаў грамадз. вайны, партыз. і рэвалюц. руху на Гродзеншчыне В. А. *Багуцкага*, С. В. *Прытыцкага*, В. З. *Харужай*, падпольныя выданні КПЗБ і КСМЗБ, макет падпольнай друкарні ЦК КПЗБ у Гродне. У тэме Вял. Айч. вайны матэрыялы пра партыз. рух, дзейнасць падпольных парт.-патрыятычных і камсамольскіх арг-цый на чале з *Беластоцкім падпольным абкомам КП(б)Б*, пра вызваленне тэр. вобласці ў ходзе *Беларускай аперацыі 1944*. Спец. стэнды прысвечаны Герою Сав. Саюза В. Д. *Сакалоўскаму*, ген.-палк. М. В. *Паўлоўскаму*, ген. арміі А. І. *Антонаву*; сав. воінам і партызанам, якія вызначыліся пры вызваленні Гродзеншчыны.





Галоўны фасад касцёла і план Гродзенскага брыгіцкага манастыра.

ны,— Ю. Дз. *Іўлеў*, В. Р. *Жолудзеў*, В. А. *Санфіравай*. У залах, прысвечаных развіццю нар. гасп. і культуры Гродзеншчыны ў 1945—70, узоры прадукцыі прамысловасці, матэрыялы пра Герояў Сац. Працы і інш. У адзеле прыроды паказаны раслінны і жывёльны свет краю, карысныя выкапні. Музей наладжвае перасоўныя выстаўкі, сустрэчы з ветэранамі баявой і працоўнай славы. Супрацоўнікі музея падрыхтавалі і выдалі серыю брашур пра гісторыю Гродна. У 1970 музей наведала больш за 112 тыс. чал.


Літ.: Гродненский гос. историко-археологический музей. Путеводитель по залам, Мн., 1963.


Л. Дз. Клок. Мінск.

ГРОДЗЕНСКІ ЕЗУІЦКІ КАСЦЁЛ І МАНАСТЫР, архітэктурны комплекс 16—18 ст. Пабудаваны ў цэнтры Гродна. У комплексе: касцёл (больш позняя назва — Фарны), калегіум, бібліятэка, аптэка, жылыя карпусы і гасп. пабудовы. Увесь комплекс займаў квартал. Касцёл (пабудаваны ў 60-я г. 17 ст.) — трохнефавая купальная базіліка [вышынёй больш за 50 *м*, у плане (*м*) 30×60]. Купал і вежы настаўлены ў 1647—63 (вежы перабудаваны і завершаны складанымі шлемамі ў сярэдзіне 18 ст.).

Касцёл, у якім спалучаюцца сістэмы базілікавага і крыжовакупальнага храмаў, да 18 ст. меў сціплы фасад. Пасля перабудовы павялічэся рысы развітага барока (трохярусны фасад з дзвюма

Генеральны план Гродзенскага езуіцкага касцёла і манастыра (уверсе). Галоўны алтар касцёла.





ажурнымі сілуэтнымі вежамі, падзелены па гарызанталі пансамі антаблемента ў, на вертыкалі — пілястрамі, дэкарыраваны складанымі профілямі, арачнымі і прамавугольнымі нішамі і праёмамі з скульптурай). Пышны і ўрачысты інтэр'ер храма насычаны арх. пластыкай, скульптурай, жывапісам (фрэскі скляпенняў, алтарныя карціны). Шматфігурная кампазіцыя гал. алтара (пачата ў 1736) вроблена з разьбянога дрэва мясцовымі майстрамі. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Барока*.

ГРОДЗЕНСКІ ЗАВОД КАРДАННЫХ ВАЛОЎ, прадпрыемства аўтамабільнай прамысловасці. Да 1969 завод «Аўтазапчастка». Асн. прадукцыя — карданныя валы да аўтамабіляў тыпу МАЗ, КрАЗ, ЗІЛ і запасныя часткі да валоў. Засн. ў 1957 на базе рамонтна-падшыпнікавага з-да. Асн. прадукцыю выпускае з 1959. У 1960 здадзены ў эксплуатацыю механа-зборачны цэх, у 1965 кавальска-прэсавы, у 1970 гал. механічны корпус. У 1970 выпушчана прадукцыі на 17,3 млн. руб. Пры з-дзе фельч. пункт аховы здароўя, б-ка, стадыён, клуб, дзіцячыя яслі-сад, будуецца (1971) закрыты плавальны басейн. З-д удзельнічае ў буд-ве пансіяната «Місхор» у Крыме.

В. Р. Акуліч, А. А. Каранкевіч. Гродна.

ГРОДЗЕНСКІ МАНЕТНЫ ДВОР, прадпрыемства ў Гродне, якое выпускала металічныя грошы ў 1706—07. Адкрыты літоўскім падскарбіем Л. Пацеем. Чаканіў шастакі на ўзор наміналаў, што выраблялiся ў Лейпцызе да 1704. На манетах былі ініцыялы (LP) і герб («Вага») Пацея.

Літ.: Рябцевич В. И. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968; Gumowski M. Monety polskie, Warszawa, 1924, с. 147.

ГРОДЗЕНСКІ МЕДЫЦЫНСКІ ІНСТЫТУТ, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1958 у Гродне. Рыхтуе ўрачоў. Мае (1971) лячэбны ф-т, цэнтр. н.-д. лабараторыю, праблемную лабараторыю вывучэння міжвітамінных узаемадносін, 5 навуч. музеяў, б-ку. У 1970/71 навуч. г. 2379 студэнтаў. Навучанне дзённае.

У 1971 на 35 кафедрах працавала 257 выкладчыкаў, у т. л. 14 праф. і д-роў н., 128 дацэнтаў і канд. н. Прафесары і д-ры навук: Ю. М. Астроўскі, Ю. Р. Войка, Я. Л. Вельман, В. М. Драгінскі, В. Ч. Вржосек, А. М. Габузаў, Л. І. Гакіпаева, С. І. Гельберг, В. С. Гудзімаў, М. В. Караблёў, С. Ш. Шпакус, А. А. Туроўскі, С. І. Юнатаў. Рэктар дацэнт Дз. А. Маслакоў (з 1962).


Асн. навук. даследаванні: фізіялогія і паталогія сардэчна-сасудзістай сістэмы і дыхання; агульныя заканамернасці марфагенезу і рэгенерацыі; навук. асновы выкарыстання вітамінаў для лячэння і прафілактыкі; пошукі новых фармакалагічных і хіміятэрапеўтычных сродкаў і вывучэнне механізму іх дзеяння і інш. Выдае матэрыялы навук. сесій і навук. студэнцкіх канферэнцый.


Літ.: [Артыкулы, прысвечаныя 10-годдзю Гродзенскага медыцынскага ін-та], «Здравоохранение Белоруссии», 1968, № 9.

М. І. Сімарот. Гродна.

ГРОДЗЕНСКІ НОВЫ ЗАМАК, помнік архітэктуры 18 ст. Пабудаваны (да 1751) на месцы Ніжняга замка, замяніў разбураны Дом караля (16 ст.). Асн. праект М. Д. Пёпельмана; у стварэнні палаца ўдзельнічалі арх. І. Х. Ядх і І. Ф. Кнобель (апошні часткова замяніў праект і ўзбудаваў палацавы касцёл). Н-падобны ў плане, з адкрытым да гал. ўезду парадным дворам палац стварае адзіны комплекс з Старым замкам (гл. *Гродзенскі Стары замак*). Меў дах з характэрным заломам. Знадворны дэкор







Галоўны фасад (рэканструкцыя), план і брама Гродзенскага Новага замка.

былі стрыманы, фасадныя сцены члянiліся адзінарнымі і здвоенымі лапаткамі, у цэнтр. частцы палаца былі спараныя пілястры, картушы паміж вокнаў. Пышныя на дэкоры, упрыгожаныя жывапісам, лянінай і разьбою на стука інтэр'еры (асабліва Круглая зала, Пасольская палата, тронная Сенатарская палата, касцёл) вызначаліся эрабнасцю і вытанчанасцю стылю ракако. У замку ў 1793 засядаў *Гродзенскі сейм*. Палац у 1941—44 спалены нім.-фаш. захопнікамі. Пасля перабудовы (1952, арх. У. Вараксін) у ім размясціўся Гродзенскі абком КПБ.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968.

У. А. Чантурыя. Мінск.

ГРОДЗЕНСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ імя Янкі Купалы, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1944 на базе Гродзенскага настаўніцкага ін-та (з 1940). Імя Я. Купалы прысвоена ў 1957. Меў ф-ты: фіз.-матэм., філал., замежных моў. У 1954 адкрыты гістар. ф-т, у 1958 — ф-т методыкі нач. навучання, у 1964 — біялага-хімічны. Рыхтуе спецыялістаў матэматыкі, фізікі, біялогіі і хіміі, рус. мовы і л-ры, бел. мовы і л-ры, гісторыі, грамадазнаўства і методыкі піянерскай работы, педагогікі і методыкі нач. навучання. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: гісторыка-пед., біялага-хімічны, фіз.-матэм. (адда.: матэматыкі, фізікі), філал. (адда.: рус. мовы і л-ры, бел. мовы і л-ры), нач. навучання. Навучанне дзённае і завочнае. Мае б-ку. Аспірантура з 1969. У 1970/71



Будынак Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы.


навуч. г. займалася 3693 студэнты. У 1971 на 19 кафедрах працавала 192 выкладчыкі, у т. л. 55 дацэнтаў і канд. н.; д-р гістар. н. прафесар Б. М. Фіх. Рэктар дацэнт Дз. С. Маркоўскі (з 1955). Асн. навук. даследаванні: гісторыя Кастр. рэвалюцыі на Беларусі; гісторыя Зах. Беларусі і мясцовых парт. арг-цый; антыкаразійная ахова металаў; барацьба з паразітафаўнай рыб у бас. Нёмана; педагогіка і методыка работы школы і інш. Выйшла 7 вып. «Вучоных запісак» (1955—61), выдае зборнікі навук. прац.


Б. М. Фіх. Гродна.

ГРОДЗЕНСКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на ПнЗ вобласці, каля дзярж. граніцы з ПНР. Пл. 2,7 тыс. км². Нас. 82,8 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 21 сельсавет; гар. пас. Скідаль і Сапоцкіна. Цэнтр г. Гродна.

Большую частку раёна займае плоска-хвалістая Нёманская нізіна, складзеная з водналедавіковых, азёрных і рачных адкладаў, нярэдка з масівамі тарфянікаў. На З — Гродзенскае ўзв. (выш. да 247 *м*), надзеленае папярочнымі і часткова скразнымі рачнымі далінамі. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 22,7 млн. *т*, у т. л. радовішча Святое — 12,7 млн. *т*; 5 радовішчаў мелу — 9,7 млн. *т*, у т. л. радовішча Грандзічы — 5,6 млн. *т*; 8 радовішчаў цагельных глінаў — 5,1 млн. м³, у т. л. радовішча Табала

Вуліца ў вёсцы Верцялішкі.






(для цэглы і аглапарыту) — 2,4 млн. $м^3$ і Пальніца-Плябанішкі — 1,2 млн. $м^3$; 11 радовішчаў пясчана-жвіровага матэрыялу — 22,8 млн. $м^3$, у т. л. радовішчы Навасёлкі — 8 млн. $м^3$, Дуброва — 5,1 млн. $м^3$ і Бераўжаны — 3,8 млн. $м^3$; пясок для сілікатнай цэглы ў Кульбаках — 9,1 млн. $м^3$. Сярэдняя т-ра студз. ад —5 да —5,5, ліп. 18 °С. Ападкаў 545 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Рэкі: Нёман з прытокамі Свіслач, Ласосна, Чорная Ганча (злева) і Котра (справа). На ПнУ воз. Белае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (76,2%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (6%), дзярнова-балотныя (10,6%), тарфяна-балотныя (3,9%) і інш. З мінер. глебаў 42,8% суглінкавых, 32,4 супясчаных, 24,8% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 42 (цана бала 0,3 *ц/га* збожжа), усіх с.-г. угоддзяў 40. Пад лясамі каля 34% тэр. раёна, мяшаныя ялова-дубова-грабовыя лясы сярэднееўрапейскага тыпу чаргуюцца з сасновымі барамі. Насяляюць раён беларусы, ёсць палякі, рускія, яўрэі, украінцы. Сярэдняя шчыльн. 30,7 чал. на 1 $км^2$. Гарадскога нас. 11,6%. Паліўная база раёна: торфабрыкетны з-д «Верцялішкі» і торфапрадпрыемства «Райста». Прамысл. буд. матэрыялаў: Скідальскі палігон жалезабетонных вырабаў, шчэбневы з-д «Мураваны» (у Жытамлянскім с/с). З прадпрыемстваў харч. прамысловасці: Скідальскія маслазавод і цукр. камбінат, які працуе як на мясцовай сыравіне, так і на прывазной (кубінскі цукр. трыснёг), Баярскі спірт. з-д, Сапоцкінскі крухмальны, Гродзенскі кансервавы з-ды; млынкамбінат № 14 (Скідаль) выпускае камбікармы. Грандзіцкі камбінат буд. матэрыялаў; райбыткамбінат у Гродне, 2 прамкамбінаты ў Скідалі і інш. Раённае (Панямунь) і Котрынскае міжраённае (Скідаль) аддзяленні Сельгастэхнікі. Зверагаспадарка «Азёры». У 1971 у Г. р. 31 калгас, 12 саўгасаў, 2 птушкафабрыкі, навуч.-доследная гаспадарка.

К а л г а с ы і і х ц э н т р ы: «Авангард» *(Луцкаўляны)*, «Баранавічы» *(Баранавічы)*, «Барацьбіт» *(Каменка)*, «Гвардыя» *(Жытомля)*, «22 верасня» *(Белыя Балаты)*, імя Дзяржынскага *(Новая Руда)*, «Дружба» *(Рыбніца)*, імя Жданава *(Галавачы)*, «Запаветы Леніна» *(Лойкі)*, імя Заслонава *(Саволейка)*, «Зорка» *(Азёры)*, «Іскра» *(Гожа)*, «Камсамолец» *(Жукевічы)*, «Кастрычнік» *(Квасоўка)*, імя Кірава *(Загоры)*, «Котра» *(Гушчыцы)*, імя Леніна *(Баранава)*, «Ленінскі шлях» *(Навумавічы)*, імя Міцкевіча (Бляліны), «Новы шлях» *(Гарны)*, «Перамога» *(Стральчы)*, «Прагрэс» *(Верцялішкі)*, «Радзіма» *(Парэчча)*, «Расія» *(Путрышкі)*, «Савецкая Беларусь» *(Губінка)*, «Савецкі пагранічнік» *(Адэльск)*, імя Вольгі Соламавай *(Лаша)*, «Сцяг камунізма» *(Навасёлкі)*, «Чырвоны барацьбіт» *(Рацічы)*, «Чырвоны сцяг» *(Гінаўны)*, «Шлях да камунізма» *(Абухава)*. С а ў г а с ы і і х ц э н т р ы: «Беларусь» *(Васілевічы)*, «Гродзенскі» *(Каробчычы)*, «Звязда» *(Скідаль)*, «Іванаўцы» *(Падлінкі)*, «Індура» *(Індура)*, «Капцёўскі» *(Капцёўка)*, «Пагранічнік» *(Гінавічы)*, «Сапоцкінскі» *(Сапоцкіна)*, «Свіслач» *(Свіслач)*, «Скідальскі» *(Скідаль)*, «30 гадоў БССР» *(Каменная Русота)*, «Яскевічы» *(Яскевічы)*. Гродзенская птушкафабрыка *(Малахавічы)*, птушкафабрыка «Нёман» *(Васілевічы)*, навуч.-доследная гасп. «Прыпяманская» *(Гродна)*.

С. гасп. спецыялізуецца на гадоўлі буйн. раг. жывёлы мяса-малочнага кірунку, вырошчванні буракоў, агародніцтве. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 44% тэр. У раёне асушаюцца балоты і забалочаныя землі. Пасля вайны асушана 10,4 тыс. *га* (1970). Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 89,0, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 37,0, бульбай 12,4, тэхнічнымі (лён-даўгунец, цукр. буракі) 4,1, кармавымі культурамі 34,7. У 1971 у раёне было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 68,0, у т. л. кароў 30,9; свіней 52,5, авечак і коз 7,4. Раён перасякаюць чыгункі Вільнюс — Беласток, Гродна — Масты і шашэйныя дарогі з Гродна ў Астрына, Шчучын, Вял. Бераставіцу, Алітус (Літ. ССР). На канец 1970 у раёне было: 21 сярэдняя, 40 васьмігадовых, 58 пач. школ, 3 школы-інтэрнаты, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. ў Сапоцкіне, 20 дашкольных устаноў;

На механізаваным таку ў калгасе «Расія».



74 клубныя ўстановы, 53 б-кі, 91 кінаўстаноўка, у т. л. 62 стацыянарныя; 15 бальніц, 42 фельч.-ак. пункты; працавала 1045 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 86 інжынераў, 137 аграномаў, 41 эканаміст, 104 заатэхнікі і вет. ўрачы, 521 настаўнік, 96 урачоў, 1597 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Сельская новь». *А. В. Духаніна.* Мінск.

ГРОДЗЕНСКІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ГУРТОК 1887—94, створаны для вывучэння нелегальнай паліт. літаратуры і падрыхтоўкі кадраў для рэвалюц. дзейнасці. У гурток уваходзіла каля 20 чал., у т. л. М. А. Дземяновіч (кіраўнік да восені 1893), С. Ф. *Галюн* (кіраўнік з восені 1893), П. І. *Шумаў*, У. Я. Мяцеліц, О. Я. Пасіт, П. Ф. Баар, М. М. Берзін, В. А. Парунова, Я. С. Вярэнік, П. Г. Чардацкі-Круглякоў, Я. Мурэіч, І. Багдановіч, А. Васільеў. Вывучалі тв. К. Маркса і Ф. Энгельса, а таксама Г. Гегеля, Л. Феербаха, Р. Оўэна, Ч. Дарвіна, М. А. Дабралюбава, М. В. Шалгунова; цікавіліся становішчам рабочых у Зах. Еўропе і дзейнасцю сацыяліст. партый. Гурток быў звязаны з рабочымі арг-цыямі Пецярбурга, Кіева, Казані, Ніж. Ноўгарада, Екацярынаслава, Беластока, з польскай партыяй «Пралетарыят» і «Саюзам польскіх рабочых». Ідэалагічная платформа гурткоўцаў пераважна марксісцкая. Адмаўлялі ідэалогію і тактыку «Народнай волі», мелі сувязі з рабочымі і інтэлігенцыяй Гродна, сялянамі Гродзеншчыны, вучнямі рамеснага вучылішча. У 1894 паліцыя арыштавала членаў гуртка. Зрабіў уплыў на развіццё рэвалюц. руху ў Паўн.-Зах. краі. *М. В. Віч.* Мінск.


ГРОДЗЕНСКІ СЕЙМ, надзвычайны, апошні сейм Рэчы Паспалітай. Скліканы ў Гродне пасля ўвядзення ў Польшчу і Вял. кн. Літ. рус. і прускіх войск для зацвярджэння рускa-прускай канвенцыі ад 23.1.1793 пра 2-і падзел Рэчы Паспалітай.

Каб задушыць апазіцыю і прымусіць сейм згадзіцца з падзелам, рус. пасол Я. Я. Сіверс загадаў акружыць войскамі горад і замак, дзе засядаў сейм. З горада нікога не выпускалі. Сейм пачаўся 17 чэрв. і вынес рашэнне заключыць трактат пра падзел толькі з Расіяй. Трактат падпісаны 22 ліп., ратыфікаваны сеймам 17 жн. Паводле яго да Расіі адыходзіла цэнтр. частка Беларусі і Правабярэжная Украіна. Сейм не згадзіўся з патрабаваннямі Прусіі, якія ставілі пад удар існаванне Польшчы. Пасля пагрозы Прусіі пачаць ваен. дзеянні 23 вер. пры ўсеагульным маўчанні (ніхто з дэпутатаў на працягу дня не ўзяў слова) маршалак сейма залічў пра ратыфікацыю дагавору з Прусіяй («маўчанне — знак згоды»), паводле якога да Прусіі адышлі спрадвечныя польскія землі — Гданск, Торунь, Познань. 23 ліст. на апошнім пасяджэнні сейма без абмеркавання прынята новая канстытуцыя Рэчы Паспалітай. Г. с. вядомы ў гісторыі пад назвай «нямы сейм».

Літ.: И л о в а й с к и й Д. Гродненский сейм 1793 года. Последний сейм Речи Посполитой, М., 1870; К о с т о м а р о в Н. Последние годы Речи Посполитой, 3 изд., т. 1—2, СПб., 1886.

В. М. Горчаў. Мінск.

ГРОДЗЕНСКІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ІНСТЫТУТ, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1951 у Гродне. Рыхтуе аграномаў-палыводаў, аграномаў па ахове раслін, заатэхнікаў. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: агранамічны, заатэхнічны, аховы раслін, завочны, павышэння кваліфікацыі. Навучанне дзённае і завочнае.




Будынак Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

Ёсць музей анатоміі жывёлы, навуч.-доследная гасп., б-ка. У 1970/71 навуч. г. займалася 2542 студэнты. У 1971 на 17 кафедрах працавала 145 выкладчыкаў, у т. л. 73 дацэнты і канд. н.; д-р біял. н. праф. А. А. Акулінін. Рэктар дацэнт Ю. Р. Ягораў (з 1965). Асн. навук. даследаванні: эканоміка с. гасп. Гродзенскай вобл., выкарыстанне зямель і севазваротаў у калгасах, барацьба са шкоднікамі і хваробамі с.-г. культур, распрацоўка мер па павышэнні прадукцыйнасці жывёлагадоўлі і інш. Выдадзены 4 вып. «Прац» (1954—58), 6 зб. навук. прац (1962—70) і матэрыялы XIII навук. канферэнцыі (1967).

Р. Б. Сапалёў. Гродна.

ГРОДЗЕНСКІ СТАРЫ ЗАМАК, комплекс абаронных умацаванняў, культавых і грамадскіх будынкаў, які склаўся ў 11—19 ст. Узнік як стараж. руская пагранічная крэпасць

Гродзенскі Стары замак у 14 — пач. 15 ст. пры Вітаўце (злева: рэканструкцыя); у канцы 16 ст. пры Стэфане Баторыі (рэканструкцыя замка і план 1-га паверха); сучасны выгляд (унізе).




Гародня (Гародна) у канцы 11 ст. на высокім і крутым правым беразе Нёмана каля вусця Гараднічанкі. Стаў ядром будучага Гродна.

На тэр. замка ў 1931—37 археолагі выявілі рэшткі драўлянай маставой і драўляных зрубаў, т. зв. «церама» і царквы (усе 11—12 ст.; гл. *Гродзенская Ніжняя царква*). На мяжы 14—15 ст. вял. кн. літ. Вітаўт пабудаваў на месцы крэпасці гатычны пяцівежавы Верхні замак (потым названы Старым) з магутным, розных вышыні сценамі (таўшчыня 3 *м*, даўж. больш за 300 *м*; муроўка з каменя-валуноў і цэглы; цэглай выраўноўваліся каменныя рады і аблiцоўваліся вежы). Замак (абрыс яго плана падобны да трохвугольніка) аддзяляўся ад горада ярам і ровам. Сцены і вежы (круглага сячэння «стоўп», 13 ст.; чатыры квадратнага сячэння, 14—15 ст.; паўд.-ўсходняя — узная вежа мела пад'ёмны драўляны мост, які злучаў Верхні замак з Ніжнім) былі ўмацаваны контрфорсамі. Да крапасной сцяны, павернутай да горада, і да Ніжняга замка прылягаў невялікі двухпавярховы палац [(*м*) 45×15]. Ад таго часу асталіся рэшткі *Гродзенскай Верхняй царквы*. У апошняй чвэрці 16 ст. (каля 1580, па інш. звестках — 1586) пры польскім каралі Стэфане Баторыі Стары замак перабудаваны. Ад умацаванняў часоў Вітаўта асталіся толькі сцены і некат. вежы. Паводле праекта італьян. архітэктара Скота з Пармы будаваўся вял. рэнесансавы палац [(*м*) 21×60] і ўпрыгожваўся знадворку дэкар. атыкам, тонкімі ліштвамі вокнаў, эркерамі з фігурнымі завяршэннямі. Палац быў прыстасаваны для абароны — меў тоўстыя сцены, у ім адсутнічаў парадны вестыбюль з лесвіцай. Невялікія памяшканні другога паверха (кардэгардыя, архіў, скарбніца, кладоўкі, канцылярыя) былі аздоблены цэглай, пакоі каралеў на 2-м паверсе — шліфаваным гіпсам, кафляй і разьбой, падлога вылажана керамічнымі плітkамі і мармурам.

У 17 ст. пасля вайны з Расіяй замак рэстаўрыраваны пад кіраўніцтвам літ. канцлера Х. С. Паца. Вокны замка расшыраны і пазбаўлены абрамлення; драўляны пад'ёмны мост заменены пастаянным мураваным. Прыбудовы 18 ст. і надбудова 3-га паверха ў 19 ст. канчаткова змянілі аблічча палаца. У Г. С. э. размешчаны *Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей*.


Літ.: Кудряшев В. И. Гродно. М., 1960; Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Мн., 1969, с. 41; Wojciechowski J. Stary zamek w Grodnie, Warszawa, 1938.

У. А. Чантурыя. Мінск.



Ткацкі цэх камбіната.

ГРОДЗЕНСКІ ТОНКАСУКОННЫ КАМБІНАТ, прадпрыемства лёгкай прамысловасці. Асн. прадукцыя — паўшарсцяная тканіна для верхняга адзення. Уведзены ў строй у 1947. Асн. вытворчасці: апаратна - прадзільная, ткацкая і фарбавальна - аддзелачная. У 1950 выпушчана: 514 тыс. *м* гатовай, 544 тыс. *м* суравой тканіны, 332 *т* пражы, у 1960 і 1970 адпаведна 1950,0 і 2479,8 тыс. *м*, 2254 і 2922,1 тыс. *м*, 1570 і 1964,8 *т*. Пры камбінаце фельч.




Гродзенскі францысканскі манастыр. План касцёла і клаштара (злева) і галоўны фасад касцёла.

пункт аховы здароўя, Палац культуры, 2 б-кі, аматарская студыя кінамастацтва, нар. тэатр, нар. ансамбль танца, дзіцячая балетная студыя, піянерскі лагер, дзіцячыя дашкольныя ўстановы, аранжарэя. *Ф. Р. Янчанка.* Гродна.

ГРОДЗЕНСКІ ТЭАТР ТЫЗЕНГАЎЗА (Гродзенскі балет Тызенгаўза), створаны падскарбіем літоўскім, старостам Гродні А. *Тызенгаўзам* каля 1770. У першыя гады ставіліся невялікія оперы і камедыі, з 1778 пастаральныя, алегарычныя і жанравыя пантамімныя балеты: «Сялянскі балет» (уключаў «Вясковы балет», «Дударскі квартэт», «Балет пекараў», 1778), «Hillasie i Silwji» (у 1785 паказаны ў Варшаве) і інш.


Асн. склад трупы (польскія і бел. прыгонныя, каля 60 чал.) быў абучаны франц. балетмайстрам Ф. Ле Ду ў спецыяльна створанай у Гродне балетнай школе, што знаходзілася ў «Крывой афіцыне» на Гараднічы («Музычны флігель», пабудаваны ў 60-я г. 18 ст.). Артысты: М. Адамовіч, Е. Валінскі, М. Вясельская, А. Кухальскі, Р. Лаўцэвіч, М. Малевіч, М. Малінская, М. Рымінскі, Р. Яшукевіч і інш.; у 1778 працавалі італьян. танцоўшчыкі Л. і К. Петынеці. Трупа была падорана каралю Станіславу Аўгусту і разам з прыгонным балетам Слонімскага т-ра М. Агінскага стала асновай польскага балета — «Т-ва танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці» (да 1794). *Г. І. Барышаў.* Мінск.

ГРОДЗЕНСКІ ФРАНЦЫСКАНСКІ КАСЦЁЛ І МАНАСТЫР, архітэктурны комплекс барока. Заложаны ў 1635 на левым беразе Нёмана.





1




2



3

Гродна.


1. Горад Гродна на гравюры 16 ст.
2. Плошча імя У. І. Леніна.
3. Від на цэнтральную частку горада.
4. Стадыён «Чырвоны сцяг».
5. Савецкая плошча.
6. Мікрараён па вул. М. Горкага.




4

5


6







Гродзенская вобласць.

1. Рака Нёман каля г. Масты.
2. Курган Славы на праспекце Касманаўтаў у Гродне.
3. Калгасны дом адпачынку «Рэчанька» ў Дзятлаўскім раёне.
4. Ліда. Вуліца Кірава.
5. На палях калгаса «Расія» Гродзенскага раёна.
6. Прадзільны цэх Гродзенскай бавоўнапрадзільнай фабрыкі.
7. Уборка сена ў саўгасе «Тарнова» Лідскага раёна.












Складаны рэльеф мясцовасці вызначыў асіметрычнае вырашэнне комплексу і незвычайнае спалучэнне манастырскіх карпусоў і касцёла, надаў забудове маляўнічасць. У 18 ст. трохнефавы касцёл адноўлены пасля пажару, значна змяніліся яго фасады. З левага боку да касцёла прылягае званіца з самастойным уваходам.

ГРОДЗЕНСКІ ХІМІЧНЫ КАМБІНАТ імя С. В. Прытыцкага, прадпрыемства хімічнай прамысловасці. Створаны ў 1970 на базе азотнатукавага і капралактамавага заводаў. Асн. прадукцыя: капралактам, сінт. вадкі аміяк, грануляваная аміячная салетра, грануляваны і крышталічны карбамід. Выпускаюцца таксама аміячная вада, азот у балонах, серная кіслата і інш. У 1960 пачалося будаўніцтва азотнатукавага завода. Першую прадукцыю — грануляваную аміячную салетру — даў у снеж. 1963. Са студз. 1965 вырабляе аміяк і карбамід. У 1969 уведзены ў строй цэх олеуму, у 1970 — вытв. капралактаму, цэх сульфату амонію, у 1971 цэх аміяку і цэх карбаміду 2-й чаргі. Пры камбінаце прафілакторый, паліклініка, 2 фельч. пункты аховы здароўя, турысцкая база, піянерскі лагер, 2 б-кі, 3 дзіцячыя камбінаты. Іл. гл. на ўкл.

Т. М. Барадзіна. Гродна.

ГРОДЗЕНСКІЯ ДАМЫ ТЫЗЕНГАЎЗА, помнік грамадзянскай архітэктуры 2-й паловы 18 ст. Пабудаваны на Гарадніцы ў Гродне (каля 1765) для паёмных майстроў Ю. Мёзерам — прыдворным архітэктарам А. Тызенгаўза.

Абапал вул. Раскошы (вул. Э. Ажэшкі) Мёзер размясціў 20 накрытых чараніцаю дамоў з плоскімі барочнымі фасадамі (разнастайнасць дасягалася вар'іраваннем шчыта). Бакавыя і заднія сцены фахверкавага тыпу зроблены з драўляных брусоў. Тарцовая сцяна, што выходзіла на вуліцу, цагляная, атынкаваная. Дамы мелі мансарды і вызначаліся кампактнасцю плана [(м) 8×9]. Г. д. Т.— першая на Беларусі комплексная забудова горада тыпавым маламетражным жыллём з новымі канструкцыямі і эканам. спалучэннем розных буд. матэрыялаў. *У. А. Чантурыя.* Мінск.



Генеральны план, фасады і планы паверхаў гродзенскіх дамоў Тызенгаўза.

ГРОДЗЕНСКІЯ КАРАЛЕЎСКІЯ МАНУФАКТУРЫ (Тызенгаўза), прамысл. прадпрыемствы, заснаваныя ў 2-й пал. 18 ст. ў Гродзенскай і Брэсцкай эканоміях па ініцыятыве гродзенскага старосты А. Тызенгаўза. Усяго было 21 прадпрыемства (гл. табл.).

Гродзенскія мануфактуры

Населены пункт	Від вытворчасці	Гады існавання	Колькасць рабочых на 1780
Азёры Гродзенскага пав.	Суконна-капялюшная	да 1845	
Брэст	Суконная	1770—90	20
Высоцк	Дывановая	да 1845	
Гародніца	Залататкацкая	1779—83	30
Гародніца	Каратная	1770—83	50
Гародніца	Гарбарная	1777—1860	50
Гародніца	Палатняная	1770—1845	30
Гародніца	Фарбавальная	1770—94	
Гародніца	Суконная	1770—94	150
Гародніца	Панчошная	1768—83	50
Гародніца	Шаўкаткацкая	1770—1888	150
Гродна	Металічных вырабаў	з 1730	
Гродна	Ігральных картаў	з 1760	
Гродна	Пацерак	з 1770	
Гродна	Карункавая		
Гродна	Ружэйная		
Гродна	Гарматная		
Гродна	Камлотная		
Гродна	Паркалянабіўная		
Ласосна	Тонкасуконная	1766—1860	30
Рудня каля в. Маларыта Брэсцкага пав.	Металургічная	1768—90	180

У 1766 засн. «кампанія шарсцяных мануфактур», якая адкрыла 3 суконныя мануфактуры. Найбольшая з іх у Гародніцы мела 40 ткацкіх станкоў і інш. абсталяванне. Фарбавальнае адда. хутка выраслa ў самастойную мануфактуру. Металургічны з-д у Рудні меў домну для выплаўкі чыгуну, 2 домніцы для выплаўкі сталі, 2 плавільныя печы для адліўкі металу ў формы, вадзяныя рухавікі. Гродна ў 2-й пал. 18 ст. стала важным цэнтрам маст. ткацтва на Беларусі. Тут выраблялiся шаўковыя, «літыя» паясы накшталт слуцкіх. На Г. к. м. працавала каля 1500 хлопцаў і дзяўчат з сем'яў прыпісных казённых сялян. Столькі ж было і надомных прадзільшчыц. Рабочы дзень — з 5 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара. Кіравалі мануфактурамі кваліфікаваныя майстры, часцей наёмныя з Францыі, Бельгіі, Швейцарыі, Расіі і інш. (каля 70 чал.). Станкі, інструменты, 70% сыравіны прывозілі з-за мяжы. На мясц. рынках набывалі

25% сыравіны, 5% давала *Гродзенская эканомія*: шэрсць, драўніну, дошкі, вугаль, дзёгаць, смалу. У 1776 у Гродне адкрыта камерцыйная кантора для крэдытавання замежных закупак, у Пастовах, Быцені і інш. створаны крамы продажу сукна, хустак і інш. Нізкая прадукцыйнасць працы, высокая плата замежным майстрам былі прычынай высокага сабекошту тавараў — на 50% вышэй за замежныя. Прадукцыя, асабліва прадметы раскошы, не мела збыту і залеживалася на складах. У выніку большасць прадпр. да канца 80-х г. 18 ст. закрылася.

Пасля далучэння Гродзеншчыны да Расіі дзейнасць некат. мануфактур адноўлена на аснове наёмнай працы. Гэта былі адны з першых капіталіст. мануфактур на Беларусі. Г. к. м. садзейнічалі развіццю на Беларусі буйной прамысловасці.

Літ.: Гибляński И. Г. Граф Антоний Тизенгауз и гродненские королевские мануфактуры, П., 1916; Гродно (Исторический очерк), 2 изд., Мн., 1964; Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795—1861 гг.), Мн., 1966, с. 63—65.

Я. Н. Мараш. Гродна; *У. У. Грамовіч.* Мінск.

ГРОДЗЕНСКІЯ ФІЛАСОФСКІЯ РУКАПІСЫ, трактаты на лацінскай мове, напісаныя ў Гродне ў канцы 17 — пач. 19 ст. членамі бернардзінскага манашскага ордэна (Л. Дулевічам, Б. Мажэйкам, Ю. Мышкоўскім, Ф. Пшыленскім, Б. Станкевічам, І. Сцірпейкам і інш.); некат. належаць дамініканцам, езуітам, кармелітам. Вядома каля 50 трактатаў аб'ектыўна-ідэаліст. кірунку. Аўтары прапаведуюць тэалагічны пункт гледжання на стварэнне свету богам. У асобных галінах філас. ведаў дапускаюць адхіленне ад ідэалізму, набліжаюцца да навук. тлумачэння некат. праблем.

Філасофію паводле правілаў схаластыкі аўтары трактатаў падзяляюць на 4 часткі: логіку (philosophia rationalis), фізіку (philosophia naturalis), метафізіку (philosophia supernaturalis) і этыку (philosophia moralis). Кожная частка падзелена на разважанні (disputatio), якія ў сваю чаргу падзяляюцца на пытанні (quaestio), пытанні — на секцыі (sectio), секцыі — на тэзісы, доказы, пярэчанні і інш. Структура трактатаў заснавана на прынцыпе «за» і «супраць». У логіцы аўтары апіраюцца пераважна на ідэі Д. Скота, У. Окама, Арыстоцеля, Парфірыя, Баэцыя. Даследуюцца ўласцівасці лагічнага квадрата, умовы строгай і нястрогай дыз'юнкцыі і іспіннасці кан'юнкцыі. Абмяркоўваюцца законы вылічэння выказванняў. З спрэчкі 18 ст. на аўтараў рукапісаў пачынаюць уплываць ідэі новай філасофіі і прыродазнаўства. Паступова змяняецца структура і змест трактатаў. Значную частку ў іх займае натурфіласофія, прыводзіцца больш прыродазнаўчанавук. фактаў (апісанне э'лў, эксперыментаў, схемы прылад і інш.). Логіка адыходзіць на задні план. Пры выкладанні фізікі Арыстоцеля намячаецца пераход да філас. аналізу новага прыродазнаўства. Разглядаюцца погляды Р. Дэкарта, І. Ньютана, М. Каперніка і інш., якія ў адных трактатах крытыкуюцца, а ў другіх падтрымліваюцца. Некат. аўтары схіляюцца да прызнання геліяцэнтрычнай сістэмы, нягледзячы на яе забарону каталіцкай царквой. Сістэма Каперніка, паводле іх слоў, хоць і супярэчыць свяшчэннаму пісанню, але адпавядае законам механікі і астр. назіранням. Сістэма Пталамея адхіляецца як неадпаведная законам прыроды (Мышкоўскі, Станкевіч, Сцірпейка і інш.). Абмяркоўваюцца спекулятыўныя касмалагічныя праблемы (напр., ці самай дасканалая Зямля сярод нябесных целаў). Большасць аўтараў лічыць Зямлю звычайнай планетай Сонечнай сістэмы. Пытанне пра існаванне жыцця на інш. нябесных целах абмяркоўваецца амаль ва ўсіх рукапісах сярэдзіны 18 ст., аднак суджэнні маюць імавернасны характар. У канцы 18 — пач. 19 ст. натурфіласофія паступова ператвараецца ў спец. раздзелы фізікі (механіка, гідраўліка, электрычнасць і інш.).

Кр.: Рукапісы рукапіснага аддзела навук. бібліятэкі Вільнюскага дзярж. ун-та імя В. Капсукаса, Ф. 3.— № 53, 497, 498, 551, 552, 556, 684, 685, 701, 796, 797, 806, 808, 851, 853, 856, 863, 866, 873, 912, 1396, 1471, 2152. *А. А. Варанавічус.* Вільнюс; *Э. К. Дарашэвіч.* Мінск.


ГРОДЗІ, вёска ў Палянскім с/с Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Крылова. За 12 *км* на Пн ад Ашмян, 230 *км* ад Гродна, 8 *км* ад чыг. ст. Гудагай, на шашы Ашмяны — г. п. Астравец. 252 ж., двароў 83 (1971). Філіял атэльe быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ГРОДНА, горад, цэнтр Гродзенскай вобл. Прыстань на р. Нёман. Чыг. вузел. Аэрапорт. 132 тыс. ж. (1970).

Гістарычны нарыс. Г.— летапісны Городень, Городна, Городня. Магчыма, назва паходзіць ад слоў «гарадзіць», «агароджваць». Упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1128 як удзел кн. Усевалада Давыдавіча (гл. *Гарадзенскае княства*). Археал. раскопкі Замкавай гары (1932—39, 1949) сведчаць пра існаванне горада ў 11 ст., пра развіццё рамёстваў, гандл. сувязей са старажытнарус. гарадамі, Прыбалтыкай, Польшчай і пра высокую культуру дойлідства ў 12 ст. Суседства з літ. і польск. землямі вызначала яго стратэгічнае і гандл. значэнне. З 40-х г. 13 ст. Г. ў складзе Вял. кн. Літоўскага. У 13—14 ст. нераз разбурана і спалена нямецкімі рыцарамі (1284, 1306, 1311, 1328, 1393). У 1-й чвэрці 14 ст. жыхары Г. на чале са старостам *Давыдам Гарадзенскім* паспяхова змагаліся супраць нямецкага агрэсараў. Воіны з Г. ўдзельнічалі ў *Грунвальдскай бітве 1410.* З 1376 князем Г. стаў Вітаўт. Пры ім Г. важны палітычны і гандл. цэнтр, другая сталіца Вял. кн. Літ., каля Верхняга замка (гл. *Гродзенскі Стары замак*) збудавана мураваная крэпасць (Ніжні замак). У 1391 Г. атрымала магдэбургскае права. З 1413 павятовы горад Троцкага ваяводства. У 16 ст. ў Г. было больш за 700 дамоў, каля 4 тыс. ж. У 1579—86 Г.— рэзідэнцыя караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя, перабудаваны Стары замак. У 1591 засн. брацкая школа, друкарня, дзе выдаваліся кнігі і на бел. мове. У 16—17 ст. Г.— цэнтр рамесніцкай вытворчасці, было больш за 50 прафесій рамеснікаў. У 17—18 ст. у Г. ўзніклі шматлікія манашскія ордэны, калегія езуітаў, будаваліся манастыры, касцёлы. У рус.-польскую вайну 1654—67 заняты рус. (1655—57) і шведскімі (1657—61) войскамі. У 1678—79 у Г. адбыўся сейм Рэчы Паспалітай, на якім заключаны саюз з Расіяй супраць Турцыі. У Паўн. вайну 1700—21 заняты шведамі (1705—08). У 70—80-я г. 18 ст. гродзенскі староста А. Тызенгаўз заснаваў у ваколіцах Г. суконную, палатняную, шаўковую, панчошную, карэтную, ружэйную і інш. мануфактуры, на якіх працавала каля 1500 чал. (гл. *Гродзенскія каралеўскія мануфактуры*); адкрыты школы бухгалтэры і каморніцкія, ветэрынарнае вуч. (пазней ператворана ў мед. вуч.), будаўнічае вуч., кадэцкі корпус, б-ка, музей гісторыі прыроды, батанічны сад, тэатр і першае на Беларусі і ў Польшчы балетнае вуч. На *Гродзенскім сейме* 1793 зацвярджаны 2-і падзел Рэчы Паспалітай. У час паўстання 1794 Г. захоплена атрадамі Т. Касцюшкі (жн.). 23.2.1795 апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў у Новым замку Г. акт адрачэння ад трону. Паводле 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795) Г. ў складзе Расійскай імперыі. З 1796 павятовы горад Слонімскай, з 1797 Літоўскай губ., з 1801 цэнтр *Гродзенскай губерні.* У Айч. вайну 1812 акупаваны франц. войскамі (чэрв.— снеж.), разбураны. У час паўстання 1863—64 К. Каліноўскі з В. Урублеўскім утварылі ў Г. рэвалюц. к-т, які ўзначаліў барацьбу ў вах. паветах Беларусі. У 2-й пал. 19 ст. цераз Г. пракладзена чыг. Пецярбург — Варшава (1862). Паводле перапісу 1897 у Г. было 46 919 ж., з іх 53,9% пісьменныя; 73 прамысл. прадпр. (найбольшае — тытунёвая ф-ка Шарашэўскага, засн. ў 1822, у 1892 каля 1500 рабочых), 9 навуч. устаноў, б-ка, 2 тэатры, 3 кінатэатры. У 1887—94 дзейнічаў *Гродзенскі рэвалюцыйны гурток.* У 1899 адбылася першая вялікая забастоўка (1200 рабочых тытунёвай ф-кі Шарашэўскага).

Зімою 1903—04 узнікла *Гродзенская арганізацыя РСДРП.* У рэв. 1905—07 у Г. адбываліся забастоўкі і дэманстрацыі рабочых, выступленні салдат гарнізона на чале з *Гродзенскай ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыяй РСДРП.* У жн. 1915 акупаваны нямецкімі войскамі. Летам 1918 афармілася падпольная камуніст. арг-цыя на чале з В. А. *Базуцкім.* 26.1.1919, яшчэ да выгнання нямецкага акупантаў, у Г. ўзнік першы Савет рабочых дэп. 27.4.1919 акупавана польскімі інтэрвентамі; 19.7.1920 вызвалена 3-м конным корпусам Г. Дз. *Гая.* Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліп. 1920. З кастр. 1920 да вер. 1939 Г. пад уладай бурж. Польшчы, цэнтр павета Беластоцкага ваяводства. У Г. дзейнічалі акруговыя і гарадскія к-ты КПЗБ і КСМЗБ, павятовыя к-ты Бел. сялянска-рабочай грамады і Т-ва бел. школы, адбываліся забастоўкі, антыўрадавыя дэманстрацыі працоўных; у 1926—38 існавала падпольная друкарня КПЗБ. 20.9.1939 горад вызвалены Чырв. Арміяй. Цэнтр раёна Беластоцкай вобл. (у

Від г. Гродна. Гравюра 2-й пал. 19 ст.






Гродна. Новы мікрараён па вуліцы Савецкіх пагранічнікаў.

1939 — 49,2 тыс. ж.). У Айч. вайну акупаваны нямецкімі фашыстамі (25.6.1941), якія загубілі тут больш за 33 тыс. чал., разбурылі горад. У акупаваным Г. дзейнічалі парт.-патрыятычныя, антыфаш. арг-цыі на чале з *Беластоцкім падпольным абкомам КП(б)Б.* 16.7.1944 вызвалены часцямі 2-га і 3-га Бел. франтоў. 17 вайсковым часцям і злучэнням, якія вызвалялі Г., прысв. ганаровае найменне «Гродзенскіх».

Гаспадарка. Г.— адзін з буйных прамысл. і культ. цэнтраў Беларусі. Дае каля $^2/_5$ валавой прадукцыі прамысл. вобласці. Працуе каля 50 прадпрыемстваў. У структуры прадукцыі прамысловасці 1-е месца займае лёгкая (38,2%, 1970), найб. прадпрыемствы: *Гродзенскі тонкасуконны камбінат, Гродзенская бавоўнапрадзільная фабрыка, Гродзенская абутковая фабрыка,* гарбарны з-д, ф-кі швейная і швейных спартыўных і пальчаткавых вырабаў. Развіта харч. прамысловасць (21,4%): тытунёвая ф-ка «Нёман», мясакамбінат, млынкамбінат, хлебакамбінат, малочны, рыбны, вінаробны і піваварны з-ды. Новая галіна прамысловасці — хімічная (17,9%) — *Гродзенскі хімічны камбінат.* Хутка развіваецца машынабудаванне і металаапрацоўка: *Гродзенскі завод карданных валоў,* з-ды аўтамаб. агрэгатаў, гандл. машынабудавання, тэхнал. аснасткі, сантэхн. загатовак, «Электрапрылада», газаазапорнай арматуры. У сувязі з вялікім жыллёвым і прамысл. буд-вам шырока развіваецца вытворчасць буд. матэрыялаў. З-ды зборнага жалезабетону, жалезабетонных вырабаў і жалезабетонных канструкцый, камбінаты буд. матэрыялаў і домабудаўнічы. Дрэваапр. камбінат, мэблевая ф-ка, шклозавод, ф-кі афсетнага друку і дзіцячых цацак; ЦЭЦ, ЦЭЦ-2. Горад амаль поўнасцю газіфікаваны (дашаўскі прыродны газ). Гарадскі транспарт — аўтобусы.

Ахова здароўя. У Г. па пач. 1939 было 3 бальніцы (2 прыватныя) на 246 ложкаў,


Гродна. Гасцініца «Беларусь» па вуліцы М. Горкага.



2 паліклінікі і 3 антэкі, працавала 76 урачоў, лячэнне пераважна было платнае. У 1945 — 4 бальніцы на 780 ложкаў, 3 дыспансеры, 4 паліклінікі, 185 урачоў і 287 чал. сярэдняга мед. персаналу. На пач. 1970 было 11 бальнічных устаноў (у т. л. радзільны дом) на 2530 ложкаў (190,9 на 10 тыс. нас.), 12 паліклінік, 6 дыспансераў, 8 антэк; 941 урач (71 на 10 тыс. нас.), 1863 чал. сярэдняга мед. персаналу (140,6 на 10 тыс. нас.).

Культура. За гады Сав. улады Г. ператварылася ў значны культ. цэнтр БССР. У горадзе (на 1.1.1970) 46 дашкольных дзіцячых устаноў (на 7798 дзяцей). У 1970/71 навуч. г. 28 агульнаадук. школ усіх відаў (19 758 вучняў), у т. л. 19 сярэдніх, 2 школы-інтэрнаты, 7 сярэдніх вячэрніх і пазменных школ рабочай моладзі; 4 прафесійна-тэхн. вучылішчы (2167 навучэнцаў), 7 сярэдніх спец. навуч. устаноў [хіміка-тэхнал., гандлёва-кааператыўны, фіз. культуры тэхнікумы, палітэхнікум, муз.-пед., культ.-асветнае, муз. вучылішчы (5848 чал.)]. 3 ВНУ: *Гродзенскі педагагічны інстытут, Гродзенскі медыцынскі інстытут, Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут.* Да 1939 было 9 б-к, у т. л. 2 школьныя. У 1970 працавала 66 масавых б-к (больш за 740,4 тыс. экз.), самая вялікая — абласная б-ка імя Карскага (засн. ў 1944, кніжны фонд каля 300 тыс. экз.), 19 клубных устаноў, 15 кінаўстановак, дзярж. заапарк, *Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей*, Дом-музей Э. Ажэшкі. Выходзіць абл. газета *«Гродненская правда»*. Працуюць абл. радыёвяшчанне (з 1945), абл. студыя тэлебачання (з 1969), абл. аддзяленні Саюза журналістаў БССР, Саюза мастакоў БССР, Саюза пісьменнікаў БССР, абл. літаб'яднанне.

У Гродзенскім заапарку.



Архітэктура, мастацтва. Старадаўняе ядро горада — стараж.-рус. крэпасць Гродна (Гародня) — узнікла ў канцы 11 ст. на крутым узгорку правага берага Нёмана каля вусця р. Гарадзішчанкі. Палац князя, саборны храм, жылыя дамы былі абкружаны магутнымі сценамі з вежамі. Большая частка насельніцтва (рамеснікі) жыла ў пасадзе. Манумент. пабудовы 12 ст. *(Барысаглебская царква, Гродзенская Ніжняя царква)* сведчаць пра самабытнасць мясцовай арх. школы (гл. *Гродзенская школа дойлідства*). Арх. аблічча горада змянілася ў 14—15 ст. На месцы крэпасці кн. Вітаўт пабудаваў пяцівежавы гатычны Верхні замак (гл. *Гродзенскі Стары замак*) і злучыў яго мостам з Ніжнім замкам (у 16 ст. на яго тэр. пастаўлены Дом караля). Абаронны комплекс быў умацаваны паўкольцам праваслаўных царкваў-крэпасцей і манастырамі (Вялікім і Малым Каложанскімі). Дзве асн. магістралі пераскалі гандл. плошчу і ішлі ад Нёманскай пераправы на Вільню (вул. Вялікая і Віленская) і ад замкаў (Замкавая вул.) на Смаленск. Вуліцы злучалі цэрквы, рынкі, масты і фарміравалі кварталы фахверкавай забудовы. На Падоле (уздоўж Нёмана) жылі рамеснікі. На гандл. плошчы ў 1389 пабудаваны драўляны касцёл, а пасля 1496 — ратуша, плошча стала другім адм. цэнтрам горада. Сярод арх. помнікаў таго часу: цэрквы Уваскрасенская, Мікалаеўская, Прачысценская (на яе месцы ў 18 ст. пастаўлена ц. Раства багародзіцы, арх. І. Фантана III), Сямёнаўская, Троіцкая, Часнага Крыжа (абярэглісяне ўсе). У 16 ст. большае размах горадабудаўнічых работ, паляпшаецца гарадское добраўпарадкаванне (брукуюцца вуліцы, у 1541 будуецца водапровад). З 2-й пал. 16 ст. ў склад Г. ўваходзіць Занёманскі фарштат, звязаны з Г. пастаянным мостам. На месцы каралеўскай стайні ў 1595—1618 будуюцца *Гродзенскі бернардзінскі касцёл і манастыр*, з якіх пачалася будоўля барочных каталіцкіх манастыроў і касцёлаў (у т. л. дамініканскага манастыра), што занялі стратэг. пункты на подступах да цэнтра (гл. таксама *Гродзенскі езуіцкі касцёл і манастыр, Гродзенскі брыгіцкі касцёл і манастыр*). У канцы 16 ст. Стэфан Баторый перабудоўвае Верхні замак. Пачынае забудоўвацца Занёманскі фарштат (у 1635 закладваецца *Гродзенскі францысканскі касцёл і манастыр*; у 2-й пал. 18 ст. будуецца драўляная сінагога і інш.). У 18 ст. будуюцца манастыры: мураваны кармеліцкі (касцёл 1738—65, манастыр на мяжы 18—19 ст.) і драўляны баніфратарскі (1729), перабудоўваюцца палацы магнатаў. У сярэдзіне 18 ст. на месцы Дома караля ставіцца палац — *Гродзенскі Новы замак* (рэзідэнцыя Станіслава Аўгуста Панятоўскага), у якім адбываліся пасяджэнні сейма. У 2-й пал. 60—80-я г. А. Тызенгаўз вёў рэгулярна запланаваную забудову паўд.-ўсх. прадмесця — Гарадніцы, пабудаваў 21 мануфактуру, тыпавыя жылыя дамы (гл. *Гродзенскія дамы Тызенгаўза*), тэатр (закладзены ў 1780, перабудаваны ў 2-й пал. 19 ст.), адм. і інш. будынкі (больш за 80, абярэглося каля 20), заснаваў першы на Беларусі бат. сад. Сярод будынкаў 18 ст.: палац Тызенгаўза (60—70-я г., арх. Ю. Мёзер і Дж. Сака, мастакі П. Гежыдовіч, Л. Хібль, А. Грушэцкі, Фолвіль; не збярогся), мед. школа і кадэцкі корпус, «Муз. флігель» («Крывая афіцына»), дом віцэ-адміністратара (усе каля 1765), корчмы «Раскоша» (арх. Ю. Мёзер) і «Галеча» (абедзве каля 1765, не абярэгліся). Пасля 1795 у Г. ствараецца шэраг будынкаў у стылі класіцызму: дом віцэ-губернатара Максімовіча (пач. 19 ст.), дом № 16 па вул. Замкавай (1-я трэць 19 ст.), новы будынак ратушы з гандл. радамі (закончаны ў 1807, не абярэгліся). Да 50-х г. 19 ст. буд-ва ў Г. ішло марудна. Сярод будынкаў акруговая лячэбніца (1859), кантрольная палата (50-я г.), комплекс жылых дамоў Дабрачыннага т-ва. Пасля рэформы 1861 і пракладкі чыгункі (1862) у горадзе паявіліся новыя тыпы будынкаў: вял. даходныя дамы, вакзал і інш. Сярод помнікаў эклектычнай архітэктуры канца 19 — пач. 20 ст. тытунёвая ф-ка Шарашэўскага (1862); рэальнае вучылішча (1913), дом Тальгейма (1911, у стылі мадэрн), Народны дом, цэрквы ў т. зв. руска-візантыйскім стылі. У 1921—39 будуецца шэраг дамоў у стылі канструктывізму: жылыя дамы (вул. Цагляная, 17 верасня), будынкі, дзе цяпер знаходзяцца Дзяржбанк і Дом афіцэраў. У 1929 пастаўлены помнік Э. Ажэшцы (скульптар Р. Цэрых).

Пасля Айч. вайны Г. забудоўваўся па першым генплане (1949, арх. А. Кліменка, інж. М. Гаролік), які накіпуў радыяльную сістэму і надзел горада р. Нёман і чыгункаю на шэраг раёнаў. Гал. магістралі: Поўнач — Поўдзень (вул. М. Горкага, Савецкая, Гарнавых, Суворава) і Захад — Усход (вул. К. Маркса, праспект Касманаўтаў) — пераскаюць Савецкую пл. і злучаюць яе з аўтамагістраллю Гродна — Мінск, вул. Ажэшкі і Савецкая злучаюць цэнтр Г. з вакзалам. Другі генплан распрацаваны ў 1960—1963 (К. Басаў, Ю. Глінка, І. Мазнічка; карэкціроўка плана ў 1966 з распрацоўкай 1-й чаргі буд-ва на 1966—70). У 1958—69 узніклі жылыя кварталы па вул. М. Горкага, Калінoўскага, Пушкіна, Дзяржынскага, Ажэшкі, Парыжскай камуны, на праспекце Касманаўтаў і Савецкай пл. (арх. В. Бажко, Р. Будзько, Л. Вільчко, А. Волкаў, В. Давыдзёнак, У. Ісачанка, Я. Ліпевіч, Мазнічка, А. Сідзельнікаў, Г. Федасенка, Ю. Цялегін). Створаны Палац культуры тэкстыльшчыкаў (1958), кінатэатр «Гродна» (1961), навуч. корпус пед. ін-та (1964, Мазнічка), стадыён (1963, Бажко), аблпраект (1965, Бажко, Вільчко, Волкаў), аблвыканком (1966, А. Міхед), 9-павярховы дом на праспекце Касманаўтаў (1967, Ісачанка), гасцініца «Беларусь» (1968), галоўпаштамт (1969), шэраг навуч. устаноў і прамысл. будынкаў. Канчаецца буд-ва Палаца культуры хімікаў, Дома быту, крытага плавальнага басейна, з-да карданных валоў. Засаджаны новы гарадскі парк. Помнік У. І. Леніну (1949), памятны знак Герою Сав. Саюза М. Ц. Курбатаву на тэр. з-да карданных валоў (1965), помнік воінам, якія загінулі пры вызваленні Г. ў 1939, помнікі і абеліскі на брацкіх могілках воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні Г. ў 1944, абеліск (1948—49) у парку, помнікі на ваенных і грамадзянскіх могілках ахвярам фашызму (1964, арх. Бажко, скульптар Л. Налівайка), помнік-танк (1968, Федасенка), пастаўлены ў гонар вызвалення Г. войскамі 2-га і 3-га Бел. франтоў у 1944; Курган Славы (1969, Давыдзёнак).

У 1651—1754 пры езуіцкім калегіуме дзейнічаў школьны т-р. У 70—80-я г. 18 ст. працаваў *Гродзенскі тэатр Тызенгаўза*. У канцы 18 і ў 19 ст. выступалі пастаянныя і вандроўныя трупы: Італьянская оперная, Варшаўскі т-р В. Багуслаўскага, Нясвіжскі т-р, трупы Д. Мараўскага, М. Кажынскага, Я. Шыманскага, С. Навакоўскага, Я. Хелмікоўскага, І. Гурскай і інш. У 1802—09 (арганізатар і рэж. С. Дэшнер) і ў 1839—61 працаваў пастаянны гарадскі т-р. У пач. 20 ст. наладжваліся аматарскія спектаклі («На дне» М. Горкага, 1902; і інш.). Гастралявалі асобныя акцёры (П. Арленеў, 1892, 1909; і інш.). У 1925—29 у Г. (і Вільні) працаваў т-р Ю. Астэрвы «Рэдута». У сав. час у Г. гастралююць бел. т-ры. Дзейнічалі *Дзяржаўны польскі тэатр БССР* (1940—41), *Дзяржаўны рускі тэатр БССР* (1945—47). Працуюць (1971): *Гродзенскі абласны драматычны тэатр* (з 1947), Гродзенскі нар. т-р, нар. ансамбль песні і танца «Нёман» (кіраўнікі засл. дз. культуры БССР А. Чопчыц і Л. Ляшэнка), нар. ансамбль танца Палаца культуры тэкстыльшчыкаў. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Гродно (Исторический очерк), 2 изд., Мн., 1964; Кудряшев В. И. Гродно, М., 1960; Мараш Я. Н. и Соболь Н. И. Борьба трудящихся Гродненщины за Советскую власть (1918—1939 гг.), Гродно, 1958; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966; Воронин Н. Н. Древнее Гродно, М., 1954 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 41); Орловский Е. Гродненская старина, ч. 1, Гродно, 1910; Квитницкая Е. Д. Планировка Гродно в XVI—XVIII вв.; у кн.: Архитектурное наследство, [т.] 17, М., 1964; яе ж. Строительство Тызенгауза в Гродно, там жа, [т.] 11, М., 1958; Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968; Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии, М., 1954; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969; Чантурия В. А. и Элентух И. Б. Памятники зодчества Белоруссии. Краткий путеводитель, Мн., 1969; Белорусская ССР. Гродненская область, Мн., 1968; Белоруссия, М., 1967 (Советский Союз); Jodkowski J. Grodno, Wilno, 1923; Wojciechowski J. Stary zamek w Grodnie, Warszawa, 1938.

І. І. Трухан (гаспадарка), *Я. Г. Звяруга* (археалогія). Мінск; *Я. Н. Мараш, Б. М. Фіх* (гістар. нарыс), *А. І. Ульяновіч* (культура). Гродна; *У. А. Чантурыя* (архітэктура). Мінск; *В. В. Бажко* (архітэктура). Гродна; *Дз. У. Стэльмах* (тэатр). Мінск.

«ГРОДНЕНСКАЯ ПРАВДА», грамадска-паліт. газета, орган Гродзенскага абласнога і гарадскога камітэтаў КПБ, абл. і гар. Саветаў дэпутатаў працоўных. Разлічана на шырокія колы чытачоў. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам., сельскага і культурнага жыцця вобласці, поспехі працоўных у сацыяліст. буд-ве.

Выходзіць з 9.10.1939; спачатку ў Беластоку пад назвай «Освобожденный Белосток» як орган Беластоцкага абл. і гар. Часовых управленняў, са студз. 1940 да 22.6.1941 — «Вольная праца», орган Беластоцкага абл. і гар. к-таў КП(б)Б і абл. Савета дэпутатаў працоўных. З ліст. 1943 да 6.6.1944 выдавалася на часова акупаванай ням.-фаш. захопнікамі тэр. вобласці пад назвай «Белостокская правда» (рэд. С. Майхровіч). Змяшчала матэрыялы пра становішча на франтах Айч. вайны, баявыя справы партызанаў, заклікала сав. людзей да барацьбы з фаш. захопнікамі. З 22.10.1944 пад назвай «Гродненская правда» выходзіць 5 разоў на тыдзень, з 1948 — паралельнымі выданнямі на рус. і бел. мовах, з 1963 на рус. мове. Рэд. А. У. Богуш (з 1970). *А. Д. Колас.* Мінск.

«ГРОДНЕНСКИЕ ГУБЕРНСКИЕ ВЕДОМОСТИ», афіцыйная газета, якая выдавалася Гродзенскім губернскім управленнем у Гродне з 7.1.1838 да 31.7.1915 на рус. мове. Выходзіла з дадаткамі раз, з 1891 два разы, у 1899 чатыры разы на тыдзень; у 1-ю палову 1900 штодзённа, з чэрв. 1900 да 1915 два разы на тыдзень.

Мела пераважна інфармацыйны характар, распаўсюджвалася выключна па абавязковай падпісцы. Змяшчала пастановы і распараджэнні цэнтр. і мясцовых улад і інш. афіц. матэрыялы. Мела таксама неафіц. частку, якая ў 1903—06 вылучана ў асобнае выданне пад той жа назвай і выходзіла як штотыднёвы дадатак да асн. выдання. У неафіц. частцы змяшчаліся гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы, звесткі пра цэны на падзённую плату рабочым і інш. Гл. таксама *«Губернские ведомости»*. *Н. А. Ляшковіч.* Вільнюс.

ГРОДНЕЎ Мікола (Мікалай Пятровіч; н. 25.10.1929, в. Старая Алешня Рагачоўскага р-на Бабруйскай акр.), беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1956. З сялян. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1953). Працаваў настаўнікам, школьным інспектарам, дырэктарам школы, журналістам. З 1968 у час. «Беларусь». Друкуецца з 1956. Аўтар аповесцей «Чужая віна», «Вяртанне», «Сцяпан Покат» і інш. Жыццё вясковай інтэлігенцыі, станаўленне людзей калг. вёскі, пытанні маралі, узаемаадносін моладзі — асн. тэматыка твораў Г.

Тв.: За бацькоўскім парогам, Мн., 1960; Цяжкае шчасце, Мн., 1963; Вясна была..., Мн., 1968.

ГРОЗА (Groza) Аляксандр (30.6.1807, в. Загрэнічы Тарашчанскага пав. Кіеўскай губ.— 3.11.1875), польскі паэт і выдавец. Вучыўся ў Віленскім і Дэрпцкім ун-тах. Жыў на Украіне і Беларусі. Рэдагаваў (1838—42) альманах «Rusałka» («Русалка»). У паэт. творчасці шырока выкарыстоўваў укр. і бел. фальклор. На бел. легендах заснаваны паэмы Г. «Ваўкалакі» (пра ўзнікненне Ваўкавыска), «Глухое возера», «Марына» і інш.

Тв.: Poezje, t. 1—2, Warszawa, 1852 (пад крыптан. A. S-S.); Powieści ludu i dumy, t. 1—2, Warszawa, 1855.

ГРОЗА (Groza) Петру (7.12.1884, с. Балія Хунедаарскай вобл.— 7.1.1958), румынскі паліт. і дзярж. дзеяч, доктар права. Вучыўся ў Будапешцкім, Берлінскім і Лейпцыгскім ун-тах. Паліт. дзейнасць пачаў у студэнцкія гады. У 1921—22 і ў 1926—27 міністр ва ўрадах Румыніі. У 1927 парваў з рэакц. «Народнай партыяй», у 1933 заснаваў і ўзначаліў дэмакр. сялянскую арг-цыю «Фронт земляробаў». За антыфаш. дзейнасць у 1943—44 няраз арыштоўваўся і знаходзіўся ў канцлагерах. Пасля ліквідацыі ваен.-фаш. дыктатуры ў Румыніі (жн. 1944) актыўны ўдзельнік Нац.-дэмакр. фронту, арганізаванага па ініцыятыве кампартыі Румыніі. З ліст. 1944 да люг. 1945 нам. прэм'ер-міністра ў кааліцыйных урадах. 6.3.1945 узначаліў урад канцэнтрацыі дэмакр. сіл. З дня абвяшчэння Румыніі нар. рэспублікай (30.12.1947) да чэрв. 1952 старшыня Савета Міністраў. З 2.6.1952 старшыня Прэзідыума Вял. нац. сходу.

Тв.: Рус. пер.— Я видел своими глазами страну мира, М., 1958.

ГРОЗАС (Gkrózos) Апосталас (н. 12.6.1892, г. Каматыні), дзеяч рабочага і камуніст. руху Грэцыі. З 11 гадоў працаваў на тытунёвай фабрыцы, у 1910 уключыўся ў прафс. дзейнасць, займаў адказныя пасады ў Федэрацыі тытунікаў краіны. Чл. кампартыі Грэцыі (КПГ) з 1920. За прагрэс. дзейнасць Г. няраз арыштоўвалі, каля 10 гадоў быў у турмах і ссылках. Удзельнічаў у барацьбе супраць фаш. акупантаў. З 1945 чл. ЦК, у 1948—56 старшыня Цэнтр. кантрольнай камісіі КПГ, з сак. 1956 чл. Палітбюро, з люг. 1957 старшыня ЦК КПГ. Узначальваў дэлегацыі КПГ на Маскоўскіх нарадах прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый 1957 і 1960, прысутнічаў на XX з'ездзе, кіраўнік дэлегацыі КПГ на XXI і XXIII з'ездах КПСС.

ГРОЗАЎ, вёска ў Капыльскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Інтэрнацыянал». За 18 *км* на У ад Капыля, 102 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Слуцк. Аўтобусная станцыя. 587 ж., дварОў 189 (1971). Харчкамбінат, пякарня, аддз. раённага камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, 5 магазінаў. Брацкая магіла 14 чырвонаармейцаў, якія загінулі ў барацьбе з польскімі інтэрвентамі летам 1920. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 421 жыхара вёскі. Брацкая магіла 3 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГРОЗНЫ, горад, сталіца Чэчэна-Інгушскай АССР, на р. Сунжа (прыток Церака). Чыг. станцыя. 341 тыс. ж. (1970). Нафтаздабыўная, нафтаперапр., хім., маш.-буд. прамысловасць. З-ды: нафтавага машынабудавання, электрамеханічны, аўтагаражнага абсталявання, аўтатрактарарамонтны, для рамонту буравога абсталявання і інш. Харчовая (кансервавы, вінаробчы, спіртова-гарэлачны, маслазавод; мяса- і хлебакамбінаты), лёгкая (абутковая і 2 швейныя ф-кі) прамысл. Дрэваапр. камбінат, цэментны з-д. Нафтавы ін-т, Чэчэна-Інгушскі пед. ін-т; 9 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 2 тэатры, філармонія. Музей.

Узнік у 1818 як рус. крэпасць, з снеж. 1869 горад, акр. цэнтр у Церскай вобл. У 1893 цераз Г. праклалзена чыгунка і пачалася здабыча нафты. З пач. 20 ст. важны прамысл. цэнтр Паўн. Каўказа. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У час дзянікінскай акупацыі (4.2.1919—17.3.1920) у горадзе дзейнічала падпольная бальшавіцкая арг-цыя. За гераізм у барацьбе супраць контррэвалюцыі ў 1918—20 і аднаўленне нафтавай прамысл. ў 1924 ВЦВК узнагародзіў горад ордэнам Чырв. Сцяга. З 1924 у складзе Паўночна-Каўказскага краю, цэнтр акругі, з 1929 у складзе Чэчэнскай аўтаномнай вобл., з 1944 цэнтр Грозненскай вобл., з 1957 сталіца Чэчэна-Інгушскай АССР.

ГРОМААДВОД, недакладная назва *маланкаадвода*.

ГРОМАЎ Аляксандр Ільіч (2.8.1919, в. Чухіна Старыцкага пав. Цвярской губ.— 18.4.1968), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 21.2.1944 гарматны разлік Г. першы ў палку фарсіраваў Дняпро каля в. Вішчын на ПнЗ ад Рагачова, знішчыў мінамётную батарэю. Цяжка паранены не пакінуў поля бою і знішчыў 2 варожыя кулямёты.



ГРОМАЎ Аляксандр Мацвеевіч (н. 26.11.1926, в. Кузьмінічы Гомельскага пав.), перадавік будаўніцтва, Герой Сац. Працы (1966), засл. будаўнік БССР (1961). Чл. КПСС з 1960. Удзельнік Айч. вайны. З 1951 муляр, з 1957 брыгадзір комплекснай брыгады муляроў Мінскага буд. трэста № 1. Дэлегат XXIII з'езду КПСС і XXVII з'езду КПБ. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

ГРОМАЎ Аляксей Мікалаевіч [н. 16(29).9.1911, с. Ніжні Кукмар Уржумскага пав. Вяцкай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1945. На фронце з 1942. Вызначыўся ў вер. 1943 у Камарынскім р-не Палескай вобл. На чале ўзвода адзін з першых фарсіраваў Дняпро і Брагінку. Калі загінуў камандзір роты, прыняў камандаванне на сябе. Паранены не пакінуў поля бою. Жыве на радзіме.

ГРОМАЎ Міхаіл Міхайлавіч [н. 12.(24).2.1899, Цвер], генерал-палкоўнік авіяцыі (1944), Герой Савецкага Саюза (1934). Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з лютага 1918. Удзельнік

далёкіх беспасадачных рэкордных пералётаў (1925, 1934, 1937). У Айч. вайну камандаваў ВПС Калінінскага фронту, 1-й паветр. арміяй, якая ўдзельнічала ў *Беларускай аперацыі 1944*. У 1946—55 у ВПС і Міш-ве авіяц. прамысловасці. Жыве ў Маскве.

ГРОМЕР Якаў Пінкусавіч (10.8.1879, г. Брэст-Літоўск — 11.4.1933), беларускі савецкі матэматык. Вывучаў матэматыку ў Берлінскім і Марбургскім ун-тах, пазней у Гётынгенскім ун-це, дзе ў 1912 атрымаў ступень д-ра філасофіі. У 1915—28 асістэнт А. Эйнштэйна ў Берліне. Прыехаўшы ў Мінск у 1928, быў праф. БДУ і з 1931 супрацоўнікам Фіз.-тэхн. ін-та АН БССР. Аўтар прац па матэматыцы, агульнай тэорыі адноснасці і рэлятывісцкай механіцы.

Тв.: Элементарны разгляд утварэнняў комплексных лікаў і іх тлумачэнне, «Запіскі Беларускай АН», 1936, кн. 5; рус. пер.— (разам з А. Эйнштэйнам) Доказательство несуществования всюду регулярного центрально-симметричного поля в теории поля Т. Калуцы, у кн.: Эйнштейн А. Собрание научных трудов, [пер. з нім. і англ.], т. 2, М., 1966; (з ім жа) Общая теория относительности и закон движения, там жа.

ГРОНКАВАЯ, беларускі селекцыйны сорт вішні, выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы скрыжаваннем сорта *Уладзімірская* з уральскай стэпавай вішняй (1939). Плады круглыя, важаць 4—5 *г*, цёмна-чырвоныя або амаль чорныя, кісла-салодкія, выспяваюць у сярэдзіне ліпеня. Пладаносіць на 3—4-ы год, у 8 гадоў дрэва дае да 25 *кг* пладоў. Сорт зімастойкі, устойлівы да шэрай гнілі костачкавых. Раянаваны па ўсёй Беларусі. Самабясплодны. Найлепшыя апыляльнікі: *Астеймскі грыёт*, *Навадворская*, *Мясцовая звычайная*. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Вішня*.

ГРОПІУС (Gropius) Вальтэр (18.5.1883, Берлін — 5.7.1969), нямецкі архітэктар. Вучыўся ў Мюнхене (1903—05), у Берліне (1907). Заснавальнік (1919) і дырэктар (да 1928) маст.-тэхн. школы «Баўхаўз» (з 1919 у Веймары, з 1925 у Дэсаў), якая зрабіла вызначальны ўплыў на развіццё функцыяналізму і пашырэнне прынцыпу адзінства маст. і тэхн. бакоў у архітэктуры і прыкладных мастацтвах. Пабудаваныя Г. ф-ка «Фагус» у Альфельдзе (1911, з А. Меерам) і асабліва будынак «Баўхаўза» ў Дэсаў (1926, абодва ў Германіі) — найб. значныя вехі ў станаўленні сучаснага стылю архітэктуры. У 1928 распрацоўваў праблему масавага жыллёвага буд-ва (рабочы гарадок Сіменс, Берлін, 1929). У 1934 эміграваў у Англію, працаваў з М. Фраем (Імпінгтанскі сельскі коледж, 1936—39; дом Леві ў Лондане, 1936). У 1937 пераехаў у ЗША, дзе ўзначаліў арх. аддзяленне Гарвардскага ун-та ў Кембрыджы (1938—52). У 1945 заснаваў калектыўную майстэрню «Архітэктары-супрацоўнікі», якая праводзіла ідэю індустрыялізацыі буд-ва, брыгаднага метаду працы і кардынатарскай ролі архітэктара. Тут былі створаны Гарвардскі навуч. цэнтр (1950), «жылая адзінка» ў квартале выстаўкі «Інтэрбільд» у Берліне (1957), праект ун-та ў Багдадзе (1960).

ГРОСМАЙСТАР, гл. *Званні спартыўныя*.

ГРОТ Якаў Карлавіч [15(27).12.1812, Пецярбург — 24.5(5.6).1893], рускі мовазнавец. Акад. (1858), віцэ-прэзідэнт Пецярбургскай АН (з 1889), праф. Гельсінгфорскага ун-та (1840—52) і Царскасельскага ліцэя (1852—62). Даследаваў швед. і фінскую л-ры, сканд. фальклор і міфалогію, рус. мову, л-ру і культуру. Пісаў пра М. Ламаносава, Дз. Фанвізіна, М. Карамзіна, В. Жукоўскага, К. Бацюшкава, выдаваў зборы іх твораў і пісьмаў. Аўтар прац «Спрэчныя пытанні рускага правапісу ад Пятра Вялікага да нашага часу» (1873) і «Рускі правапіс» (1885, 22 выд. 1916). У 1891 пад кіраўніцтвам і па праграме Г. пачаў выдавацца акад. «Слоўнік рускай мовы» (Г. удзельнічаў у в. 1—3, А—Д).

Тв.: Труды, т. 1—5, СПб., 1898—1903.

Літ.: Грот К. Я. (сост.). Материалы для жизнеописания академика Якова Карловича Грота, СПб., 1912.

ГРОТЭВАЛЬ (Grotewohl) Ота (11.3.1894, г. Браўншвейг — 21.9.1964), дзеяч германскага рабочага руху. Па прафесіі друкар. Скончыў Акадэмію імя Лейбніца ў Гановеры, Вышэйшую паліт. школу ў Берліне. З 1908 удзельнік маладзёжнага рэвалюц. руху, з 1912 чл. с.-д. партыі Германіі. У 1921—24 на міністэрскіх пасадах ва ўрадзе зямлі Браўншвейг, у 1925—33 дэпутат рэйхстага ад с.-д. партыі. У гады гітлер. дыктатуры Г. няраз арыштоўвалі за ўдзел у падпольным антыфаш. руху. Пасля разгрому фаш. Германіі актыўны дзеяч адноўленай с.-д. партыі, у 1945 выбраны старшынёй Цэнтр. праўлення с.-д. партыі Усх. Германіі. Выступаў за адзінства рабочага класа. На аб'яднаўчым з'ездзе кампартыі і с.-д. партыі (1946, Усх. Германія) выбраны ў Цэнтр. праўленне створанай Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі (САПГ), адзін з двух яе старшынь. З студз. 1949 чл. Палітбюро ЦК САПГ, з дня абвяшчэння ГДР (кастр. 1949) прэм'ер-міністр (з 1958 старшыня Савета Міністраў) рэспублікі. Двойчы Герой Працы (1954 і 1959).



ГРОЦЫЙ (Grotius) Гуга дэ Гроат [10.4.1583, г. Дэлфці (Галандыя) — 28.8.1645], галандскі вучоны-юрыст, гісторык і дыпламат, адзін з заснавальнікаў бурж. тэорыі натуральнага права. У міжнар. праве выставіў шэраг прагрэс. патрабаванняў: гуманнасць правілаў вядзення вайны, чалавечнасць у абыходжанні з ваеннапалоннымі і інш. Сярод прац — «Аб праве вайны і міру» (1625).

ГРОШ, назва вялікага *дэнарыя* (буйной сярэбранай манеты) у еўрап. дзяржавах у сярэднія вякі. Г. пачалі выпускаць у Генуі (Італія) у 1172, у г. Туры (Францыя) у 1266. Каля 1300 чаканку Г. пачала Чэхія, у 1329 Венгрыя, каля 1337 Польшча, у канцы 15 ст.— Вял. кн. Літ., з 1657 Расія. На рынках Бела-

русі ў 14—15 ст. асноўнай манетай быў пражскі Г. (маса 3,86 *г*, проба 0,930), у 16—17 ст.— літоўскі і польскі Г. З 1752 польскі Г. чаканіўся з медзі. У Расіі медны Г. раўняўся 2 капейкам, чаканіўся да пач. 19 ст. Пазней у Расіі Г. называлі медныя манеты коштам у ½ капейкі. Гэтая назва асталася за меднай манетай у паўкапейкі, якая выпускалася ў СССР у 1925—28. Медны Г. ёсць у абарачэнні ў Польшчы.

Літ.: Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970; Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968.

В. Н. Рабцэвіч. Мінск.

ГРО́ШЫ, своеасаблівы тавар, які выражае вартасць усіх тавараў і з'яўляецца *ўсеагульным эквівалентам*, сродкам абмену. Катэгорыя таварнай вытворчасці. Выражаюць вытворчыя адносіны ў грамадстве, іх прырода мяняецца ў залежнасці ад спосабу вытворчасці, які яны абслугоўваюць.

Узніклі стыхійна, у працэсе развіцця таварнай вытворчасці, абмену і адпаведных формаў *вартасці* — простай, разгорнутай, усеагульнай і грашовай. Спачатку ролю Г. выконвалі пэўныя тавары — збожжа, жывёла, пушніна і г. д. Калі выраб тавараў на продаж павялічыўся і абмен выйшаў за мясцовыя рамкі, узнікла патрэба перайсці да адзінага ўсеагульнага эквіваленту. Гэтая роля замацавалася за высакароднымі металамі — *золатам* і серабром (з 20 ст. толькі за золатам). З развіццём і пашырэннем *грашовага абарачэння* замест золата сталі ўжываць яго заменнікі — *грашовыя знакі*. Сутнасць і роля Г. у эканоміцы выяўляюцца ў функцыях, якія выконваюць Г.: меры вартасці, сродкаў абарачэння, утварэння скарбаў, плацяжу і сусветных Г. Як мера вартасці Г. выражаюць вартасць тавару ў яе ўсеагульнай форме, вартаснае параўнанне тавараў паміж сабою. Каб выканаць гэтую функцыю, наяўныя Г. не патрэбны, яны выступаюць ідэальна. Грашовае выражэнне вартасці тавару ёсць яго *цана*. Вагавая колькасць грашовага металу, прынятая ў краіне за адзінку вымярэння вартасці, г. зн. за *грашовую адзінку*, з'яўляецца *маштабам цэн*. Як сродак абарачэння Г. служаць пасрэднікам у працэсе абарачэння тавараў. Пры гэтым павінны быць толькі наяўныя Г. Як сродак утварэння скарбаў Г. з'яўляюцца ўсеагульным прадстаўніком багацця, на іх можна купіць любы тавар, іх можна хаваць у любой колькасці. Як сродак плацяжу служаць для пагашэння фін. абавязацельстваў, падаткаў, плацяжоў за камунальныя паслугі і г. д. Функцыя сусветных Г. ажыццяўляецца на сусв. рынку і ў плацежным абароце паміж краінамі. Пры капіталізме Г. ператвараюцца ў *капітал*, з'яўляюцца сродкам эксплуатацыі наёмнай працы, абслугоўваюць кругаабарот капіталу, выступаюць як мера велічыні капіталу і прыбавачнай вартасці.

Неабходнасць Г. пры сацыялізме абумоўлена таварнай вытворчасцю і дзеяннем закону вартасці. Аднак у сацыяліст. грамадстве Г. набываюць новы сац.-эканам. змест: абслугоўваюць планавы працэс расшыранага ўзнаўлення, выкарыстоўваюцца для арг-цыі гасп. разліку, уліку і кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем грамадскага прадукту, мерай працы і мерай спажывання, выкарыстоўваюцца дзяржавай на стымуляванне рацыянальнай гасп.-фін. дзейнасці асобных прадпрыемстваў, галін нар. гасп., эканомікі краіны. Замест функцыі ўтварэння скарбаў Г. пры сацыялізме набылі функцыю сацыялістычнага накаплення і зберажэнняў працоўных. З пераходам да камуніст. формы ўласнасці і камуніст. сістэмы размеркавання неабходнасць у Г. адпадзе.

Каб затушаваць супярэчнасці капіталіст. грамадства, бурж. эканамісты скажаюць сутнасць Г., сцвярджаюць магчымасць планамернага развіцця капіталізму рэгуляваннем грашовага абарачэння. Існуюць металістычная, наміналістычная, колькасная, «рэгуляванай валюты» і інш. бурж. тэорыі Г. Металістычная тэорыя (Т. Мен, У. Стафард, Ф. Галіяні) атаясамлівае Г. з высакароднымі металамі, прызнае функцыі, уласцівыя толькі металічным Г., выступае за тое, каб ад папяровых Г. вярнуцца да залатога абарачэння, і гэта быццам ліквідуе супярэчнасці капіталізму. Наміналістычная тэорыя (Дж. Берклі, Р. Хоўтры, Г. Кнап, П. Самуэлсан) лічыць Г. ўмоўнай лікавай адзінкай, якая не мае вартасці, служыць для вымярэння адноснай вартасці тавараў і ажыццяўлення плацяжоў; апраўдвае празмерны выпуск Г. і *інфляцыю*. Колькасная тэорыя (Д. Рыкарда, Дж. Міль, І. Фішэр і інш.) лічыць, што велічыня вартасці Г. знаходзіцца ў адваротнай залежнасці ад іх колькасці, што да абарачэння Г. не маюць вартасці і толькі ў абарачэнні набываюць «пакупную сілу», а прычыну росту цэн тлумачыць колькасцю Г. у абарачэнні. Таму нібыта не манаполіі вінаваты ў росце цэн, а самі рабочыя, якія дамагаюцца павелічэння заработнай платы. Тэорыя «рэгуляванай валюты» (Дж. Кейнс, Э. Хансен і інш.) спалучае наміналістычную тэорыю з колькаснай, стварае ілюзіі, што капіталіст. дзяржава можа планаваць эканоміку, рэгулюючы колькасць Г. у абарачэнні. На самай справе ў капіталіст. краінах ад празмернай эмісіі Г. павялічваюцца цэны і прыбыткі капіталістаў, скарачаецца пакупная здольнасць рабочых, расце беспрацоўе, анархія капіталіст. гаспадаркі.

Літ.: Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952, разда. 2; яго ж. Капітал, т. 1, Мн., 1952, разда. 1—3; Ленін У. І. Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве, Тв., т. 1, с. 385—386, 457—462 (Полн. собр. соч., т. 1, с. 425—426, 505—511); яго ж. І Усерасійскі з'езд па пазашкольнай адукацыі, Тв., т. 29, с. 328—329 (там жа, т. 33, с. 352—353); Денежное обращение и кредит СССР, М., 1966; Коник ин И. И. Деньги в период строительства коммунистического общества, М., 1966; Бортник М. Ю. Денежное обращение и кредит капиталистических стран, М., 1967; Критика буржуазных и реформистских экономических теорий, М., 1969, с. 56—69; Политическая экономия, 2 изд., т. 1, М., 1969.


З. І. Гіяргіёзе, А. А. Гаеўскі. Мінск.

ГРУБІ́Н Натан Барысавіч [15(27).3.1893, Крамянчуг — 17.1.1945], савецкі дырыжор. Заслужаны дзеяч маст. БССР (1940). Прафесар. У 1917 скончыў Петраградскую кансерваторыю па класах Я. Вітала (кампазіцыя) і Л. Нікалаева (фп.). Удзельнік грамадз. вайны. У 1925—37 дырыжор т-раў оперы і балета ў Харкаве, Свярдлоўску, Куйбышаве, Пермі, Ташкенце. У 1938—41 гал. дырыжор Бел. т-ра оперы і балета. Паставіў першыя нац. оперы («Кветка шчасця» А. Туранкова, «У пушчах Палесся» А. Багатырова), шэраг класічных твораў. Выкладаў у Беларускай (1940—41) і Ташкенцкай (1941—45) кансерваторыях. Аўтар некалькіх муз. твораў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ГРУБЫЯ КАРМЫ, сухія раслінныя кармы, багатыя на клятчатку (20—45%). Да іх належаць *сена, салома, мякіна*, галінкавы корм, сушаныя водарасці. Абавязкова ўваходзяць у зімнія рацыёны с.-г. жывёлы. Маюць неабходныя пажыўныя рэчывы, спрыяюць нармальнаму страваванню. Пажыўнасць 1 *кг* Г. к. 0,1—0,6 кармавых адзінак.


Літ.: Справочник по производству и использованию кормов, 2 изд., Мн., 1968.

ГРУБЭ Аляксандр Васілевіч [н. 19(31).8.1894, в. Грыгор'еўка Уфімскай губ.], беларускі савецкі скульптар. Нар. маст. БССР (1944).






1



2




3



4

Дашкольнае выхаванне.

1. Дзіцячая пляцоўка ў Першамайскім р-не г. Мінска.
2. Касманаўты. Дзіцячыя яслі-сад г. Мінска.
3. Дзіцячы сад калгаса імя Кірава Слуцкага р-на Мінскай вобл.
4. Гімнастыка. Дзіцячы сад Заводскага р-на г. Мінска.
5. Заняткі ў дзіцячым садзе г. Брэста.
6. Аркестр. Дзіцячы сад камвольнага камбіната г. Мінска.



5



6



Вучыўся на фіз.-матэм. ф-це Пецярбургскага ун-та. Служыў у Чырв. арміі (1918—19). З 1919 настаўнічаў у в. Краснаполле Магілёўскай губ. У 1924—41 жыў у Мінску, з 1941 у Маскве. У 1927—29 адзін з арганізатараў і старшыня Усебеларускага аб'яднання мастакоў, у 1929—32 чл. Рэвалюц. арг-цыі мастакоў Беларусі, у 1942—44 старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР. Спец. маст. адукацыі не меў, карыстаўся парадамі скульптара І. Шадра. Працаваў у жанры партрэта («К. Маркс», 1924; «У. І. Ленін», 1925; «М. Багдановіч», 1927). Адчуваў уплыў традыцый бел. нар. драўлянай скульптуры («Лірнік», 1926; не збярогся). Сярод работ, адзначаных рысамі стылізацыі, але лаканічных па трактоўцы, поўных унутранага напружання,— «Раб», «Тачачнік» («Праца», абодва 1928), «Чырвонаармеец» (1929). У 1931 стварае рэльефы «Пяцігодку за чатыры гады» і «Рукі прэч ад СССР». Творчасць Г. ў наступныя гады набывае паэт.-вобразны характар. Сярод работ у галіне станковай сюжэтнай кампазіцыі і манумент. пластыкі 30—60-х г. «Трактарыстка» (1935); помнікі Ф. Э. Дзяржынскаму (1932) і У. І. Леніну ў Барысаве (1935; абодва не зберагліся); дэкар. скульптура («Авіямадэліст», «Фанфарыстка»; абодва 1936) для Палаца піянераў у Мінску; «Ленін на трыбуне», «Беларус» (абодва 1939); партрэт Героя Сав. Саюза Л. М. Даватара (1942). Апошнія работы: помнік В. У. Куйбышаву ў Какчэтаве (1948), кампазіцыі на тэмы працы — «Першая баразна» (1949), «На будоўлях камунізма» (1951), «Сталявар» (1957), «Дояркі» (1961). У Дзярж. маст. музеі БССР 12 работ скульптара. Іл. гл. таксама на ўкл.

Літ.: Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960. *І. М. Ялатамцава.* Мінск.



А. В. Грубэ. Тачачнік. Дрэва. 1928 (злева, Дзярж. маст. музей БССР); Лірнік. Дрэва. 1926.

ГРУГАН, птушка сям. крумкачовых атр. вераб'іных, гл. *Крумкач.*

ГРУД, павышанае месца з багатымі глебамі на балоцістай або нізіннай мясцовасці. На ім найчасцей растуць шыракалістыя або ялова-шыракалістыя лясы. Нар. назва, якою шырока карыстаюцца і ў навук. літаратуры, каб абазначыць тыпы лесу (альховы, ясеневы Г.).

Літ.: Юркевіч І. Д. Развіццё лясной тыпалогіі ў Беларускай ССР, у кн.: Навука ў Беларускай ССР за 40 год, Мн., 1958.

ГРУДАБРУШНАЯ ПЕРАПОНА, тое, што *дыяфрагма.*

ГРУДЗІНАВА, вёска ў Клёччынскім с/с Шумілінскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Обаль. Цэнтр калгаса «Расія». За 26 *км* на З ад Шуміліна, 65 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Обаль, на шашы Віцебск — Полацк. 79 ж., двароў 31 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, адз. сувязі, магазін.

ГРУДЗІНАЎКА, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Грудзінаўскі». За 33 *км* на ПнУ ад Быхава, 40 *км* ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Быхаў. 890 ж., гасп. 296 (1971). Спіртзавод, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат санаторнага тыпу, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячыя яслі-сад, адз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У 1941 вёску часткова спалілі фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў.

ГРУДНАЯ КЛЕТКА, аснова груднога аддзела тулава ў паўзуноў, птушак, млекакормячых жывёл і чалавека, складзеная з грудных пазванкоў, рэбраў і грудзіны. Мае форму ўсечанага конуса; у чалавека сплюшчаная ў пярэдне-заднім кірунку. У грудной клетцы (грудной поласці): сэрца, лёгкія, трахея, стрававод, крывяносныя сасуды і нервы. Грудная поласць аддзелена ад брушной дыяфрагмай. Выгляд і памеры Г. к. залежаць ад спосабу жыцця, рухаў, дыхання; маюць узроставыя, полавыя, індывід. і прафес. адрозненні.

Літ.: Гурова Н. П. Возрастная морфология грудной клетки человека, М., 1965 (бібліягр.); Хирургическая анатомия груди, Л., 1955 (бібліягр.): Леонтюк А. С. Развитие элементов грудной клетки и их иннервационных связей в раннем эмбриогенезе человека, «Здравоохранение Белоруссии», 1968, № 8. *А. С. Леанцюк.* Мінск.

ГРУДНІЦА, тое, што *мастыт.*

ГРУДНОЕ ДЗІЦЯ, дзіця да аднагадовага або паўтарагадовага ўзросту, якому для росту і развіцця трэба грудное малако. Вельмі адчувальнае да неспрыяльных умоў, бо ў яго недасканалая дзейнасць нервова-рэфлекторных і кампенсаторна-абарончых механізмаў, асобных органаў і сістэм. Паталагічны працэс у Г. дз. не абмяжоўваецца адным органам або тканкай. Найб. функцыянальна недасканалыя органы стрававання і дыхання, дзе часцей узнікаюць вострыя і хранічныя хваробы. Г. дз. асабліва трэба паўнацэннае харчаванне з дастатковай колькасцю бялкоў, тлушчаў і вугляводаў (120 *кал* на *кг* масы пры нараджэнні, 100—105 *кал* у канцы першага го-

да жыцця). З аднаго месяца назначаюць вітамін D, рыбін тлушч, сокі ягад, садавіны і агародніны, з 5 мес. прыкормліваюць (пюрэ з агародніны, каша, малако, кефір, тварог), з 6—7 мес. даюць яечны жаўток, мясны булён, з 8—9 мес.— мясны фарш. З ростам Г. дз. ўдасканальваецца і дыферэнцыруецца яго цэнтр. нерв. сістэма, выпрацоўваюцца і замацоўваюцца шматлікія ўмоўныя рэфлексы.

Г. дз. да 6 тыдняў спіць каля 20 *гадз* у суткі. Т-ра цела на 0,3—0,4 °С вышэй, чым у дарослага. Пульс 130—140 удараў у мінуту. Косці складаюцца з храстковых тканак, назваючнік няўстойлівы і лёгка скрыўляецца. На другім месяцы фіксуе позірк, трымае галоўку, усміхаецца. У 3 месяцы адрозніваe зрокавыя і слыхавыя раздражняльнікі, хапае і трымае прадметы. У 4 мес. смяецца, у 5 адрозніваe блізкіх, рухі робяцца каардынаваныя, у 6 вымаўляе асобныя склады, сядзіць. Першапачатковая маса падвойваецца. Прарэзваюцца зубы. У 7 мес. поўзае, у 8 добра вымаўляе склады, самастойна садзіцца, кладзецца, трымаючыся ўстае і стаіць. У 9—10 мес. паўтарае за дарослымі склады і гукі, ведае некалькі імёнаў і слоў. Трымаючыся за прадметы ходзіць. Дзеянні робяцца мэтанакіраваныя. У год самастойна ходзіць, вымаўляе 8—12 простых слоў. Прывыкае самастойна есці. Мае 8 зубоў. Маса павялічваецца ў тры (10—12 *кг*), а даўж. цела ў паўтара раза (да 75 *см*). Спіць каля 15—16 *гадз* у суткі. Перапынкі паміж кармленнямі павялічваюцца з 3 (пры нараджэнні) да 4,5 *гадз*. Асноўнае пры доглядзе Г. дз.— чысціня. Ахова здароўя Г. дз. ў СССР забяспечваецца лячэбнымі і прафілакт. ўстановамі. Гл. *Ахова здароўя, Ахова мацярынства і дзяцінства.*


Літ.: Тур А. Ф. Физиология и патология детей периода новорожденности, 3 изд., Л., 1955; Люблинская А. А. Очерки психического развития ребенка, 2 изд., М., 1965; Дмитриева Н. М. Забота о матери и ребенке, М., 1967; Калюжин Г. А. Гигиеническое воспитание ребенка, Мн., 1965.

А. К. Усціновіч. Мінск.

ГРУЗААБАРОТ, эканам. паказчык работы транспарту па перавозцы грузаў. Вымяраецца ў тона-кіламетрах (тона-мілях) і ў тонах (Г. станцый, партоў).

ГРУЗАЗАХОПНЫЯ ПРЫСТАСАВАННІ, механізмы і прыстасаванні да грузападымальных машын, прызначаныя захопліваць і перамяшчаць грузы.

Падзяляюцца на аўтаматычныя — кіруюцца прыводам грузападымальнай машыны (грэйферы, каўшы, электрамагніты); паўаўтаматычныя — выпускаюць зашчэмлены груз пры апусканні яго на апорную паверхню (абцуговыя і эксцэнтрыкавыя захопы); неаўтаматычныя, якія замацоўваюцца і знімаюцца з грузаў уручную (крукі, сеткі, траверсы, стропы). Для перамяшчэння гафрыраваных ліставых матэрыялаў, трубаў, рулонаў паперы, бочак, шкла, апаратуры і інш. шырока ўжываюцца вакуумныя Г. п.



Грузазахопныя прыстасаванні: *1* — кюбель (коўш); *2* — крук; *3* — грэйфер; *4* — эксцэнтрыкавы захоп; *5, 8* — клешчавыя захопы; *6* — грузавы электрамагніт; *7* — строп; *9* — клямар; *10* — грузавая траверса.

Літ.: Протасов Л. П. Захватные устройства для грузов, М., 1968; Бирюков В. В. Грузозахватные приспособления для штучных товаров, М., 1969; Ланцов В. А. и Полонский Л. А. Вакуумные грузозахватные приспособления, Л., 1968.

ГРУЗДАВА, вёска ў Савіцкім с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 18 *км* на ПдУ ад Паставаў, 284 *км* ад Віцебска. 210 ж., двароў 72 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 34 сав. грамадзянам, якія загінулі ў Айч. вайну. Вядомы ў рэспубліцы аркестр цымбалістаў калгаса.


ГРУЗДЗЕЎ Іона Карпавіч (28.3.1923, в. Якіміха Сямёнаўскага пав. Ніжагародскай губ.— 27.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. ВЛКСМ. На фронце з жн. 1943. Вызначыўся 26—27.9. 1943 пры фарсіраванні Дняпра ў Брагінскім р-не Палескай вобл. Першы пераплыў раку, куллямётным агнём выбіў ворага з траншэі і прыкрываў пераправу інш. падраздзяленняў. Загінуў у баі за плацдарм.

ГРУЗДЫ (Lactarius), род шапкавых ядомых грыбоў сям. сыраежкавых. На Беларусі 5 відаў: Г. сапраўдны, хрушч (L. resimus), Г. жоўты (L. scrobiculatus), Г. асінавы (L. controversus), Г. чорны, чарнуха (L. necator), Г. перцавы, кароўка, малачай (L. piperatus). Растуць пераважна групамі ў бярозавых, хваёва-бярозавых і шыракалістых лясах у ліп.— кастр. Ідуць на засол.

Шапка да 20 *см* у дыяметры, шчыльнамясістая, ад плоскаўвагнутай да шырокалейкападобнай, з пушыстым падагнутым краем. Пласцінкі белаватыя і цёмныя. Ножка кароткая, тоўстая. Мякаць белая, з едкім млечным сокам. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Грыбы.*

ГРУЗЕЛЬ Вацлаў Пятровіч (24.9.1884, Сахачаўскі пав. Варшаўскай губ.— 21.8.1937), удзельнік рэвалюц. руху, дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1906. Працаваў брукаром. Вёў рэвалюц. работу ў Польшчы, 4 разы арыштаваны, зняволены ў турме, сасланы. З 1914 працаваў на Каўказе і Украіне, вёў рэвалюц. работу сярод будаўнікоў. Удзельнік грамада. вайны: з 1918 камісар брыгады, дывізіі на Паўд. і Зах. франтах. З 1921 старшыня Мінскага, потым Бабруйскага павятовых выканкомаў. У 1924—26 старшыня ЦКК КП(б)Б і нарком РСІ БССР. З 1926 на парт. рабоце ў РСФСР. Чл. ЦКК ВКП(б) у 1924—34. Чл. ЦВК БССР (1921—26), чл. Прэзідыума ЦВК БССР у 1925—26. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.

ГРУЗІНСКАЕ ПІСЬМО, літарна-гукавая сістэма, у якой кожная зычная і галосная фанема перадаецца асобнай літарай. Узнікла на базе арамейскага пісьма пад уплывам грэчаскага. Самыя стараж. помнікі Г. п.— надпісы на падлозе груз. манастыра ў Іерусаліме і ў царкве ў Балнісі (5 ст.). У стараж.-груз. мове



	Транскрыпцыя	Беларускі адпаведнік	Назва літар		Транскрыпцыя	Беларускі адпаведнік	Назва літар		Транскрыпцыя	Беларускі адпаведнік	Назва літар
ა	a	а	ан	ჯ	m	м	ман	ღ	ɣ	г	ган
ბ	b	б	бан	ნ	n	н	нар	ყ	q	к	кар
გ	g	г	ган	ო	o	о	он	შ	š	ш	шын
დ	d	д	дон	პ	p	п	пар	ჩ	č	ч	чын
ე	e	э	эн	ჟ	ž	ж	жан	ც	c	ц	цан
ვ	v	в	він	რ	r	р	раэ	ძ	dz	дз	дзіл
ზ	z	з	зэн	ს	s	с	сан	წ	ʦ	ц	ціл
თ	t	т	тан	ტ	ṭ	т	тар	ჭ	č	ч	чар
ი	i	і	ін	უ	u	у	ун	ხ	x	х	хан
კ	ḳ	к	кал	ფ	p	п	пар	ჯ	ǯ	дж	джан
ლ	l	л	дас	ქ	k	к	кан	ჰ	h	г	гаэ

Грузінскі алфавіт.

быў алфавіт хуцуры (царкоўнае пісьмо), новагрузінская карыстаецца алфавітам мхедрулі (воінскае пісьмо), які ўзнік у 11 ст.


Літ.: Церетели Г. В. Древнейшие грузинские надписи из Палестины, Тбилиси, 1960.

ГРУЗІНСКАЯ МОВА, належыць да картвельскай групы *іберыйска-каўказскіх моў*. Багатая на дыялекты, сярод іх вылучаюцца 2 асн. групы: усходняя (картлійскі, кахецінскі, горскія дыялекты) і заходняя (імерэцінскі, рачынскі, гурыйскі). Акрамя Груз. ССР, пашырана ў Азерб. ССР, у Турцыі і Іране. На ёй гаворыць болей за 3 млн. чал.

У фанетыцы 5 галосных і 28 вычных; у сістэме вычных назіраецца 5 траічных проціластаўленняў: звонкі — глухі — змычна-гартанны. Асобна вылучаюцца фарынгальны і ларынгальны. Слабы сілавы націск на пач. складзе слова. У марфалогіі — аглюцінацыя з мноствам прэфіксальных формаў (гл. *Аглюцінатыўныя мовы*). У сінтаксісе — эргатыўная канструкцыя. Гісторыя Г. м. пачынаецца з 5 ст., калі ўзніклі першыя пісьмовыя помнікі. Вылучаюць стараж.-груз. мову (5—11 ст.) і новагруз. (з 12 ст.), пачатак якой ідзе ад паэмы Ш. Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры». Літ. мова (на аснове картлійскага дыялекта) мае багатыя традыцыі, якія плённа развіваюцца ў сучаснай маст. і публіцыст. л-ры. Гл. таксама *Грузінскае пісьмо*.

Літ.: Языки народов СССР, т. 4, М., 1967, с. 22—61 (бібліягр.). *В. У. Мартынаў*. Мінск.

ГРУЗІНСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА (Сакартвелас Сабчата Сацыялістуры Рэспубліка), Грузія, утворана 25.2.1921. Размешчана ў цэнтр. і зах. частках Закаўказзя, на Пд мяжуе з Турцыяй. У складзе Г. Абхазская АССР, Аджарская АССР і Паўд.-Асецінская а. в. Пл. 69,7 тыс. км². Нас. 4688 тыс. чал. (1970). Сталіца Тбілісі. Падзяляецца на 67 раёнаў; 51 горад, 55 гар. пасёлкаў. Карты і іл. гл. на ўкл.




Дзяржаўны лад. Груз. ССР — саюзная савецкая сацыялістычная рэспубліка. Увахо-дзіць у склад СССР на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя. Дзейнічае канстытуцыя, прынятая 13.2.1937 Надзвычайным 8-м Усегрузінскім з'ездам Саветаў. Уся ўлада ў рэспубліцы належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных. Вышэйшыя органы дзярж. улады: Вярх. Савет, які выбіраецца на 4 гады (1 дэпутат ад 11 тыс. нас.), а ў перыяд паміж сесіямі Прэзідыум Вярх. Савета. Вышэйшы выканаўчы орган — Савет Міністраў. Мясцовыя органы дзярж. улады: Савет Паўд.-Асецінскай а. в., раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія Саветы дэпутатаў працоўных. Суд. сістэма: Вярх. суд Груз. ССР, Вярх. суды Абхазскай АССР і Аджарскай АССР, суд Паўд.-Асецінскай а. в. і раённыя нар. суды. Груз. ССР мае свой дзярж. герб, флаг і гімн.

Прырода. Г. — горная краіна. Гарамі і перадгор'ямі занята 87% тэр. На Пн Гал. Каўказскі хр. (найвыш. частка складкавай горнай сістэмы Вял. Каўказа), амаль усе вяршыні больш за 3000 м, укрытыя вечным снегам і ледавікамі (г. Шхара, 5058 м — на граніцы з Кабардзіна-Балкарскай АССР і Казбек, 5033 м; Ушба, 4695 м). Найважнейшыя перавалы: Крыжовы — 2384 м, Мамісонскі — 2829 м, Клухорскі — 2781 м. Ад Гал. Каўказскага хр. адыходзяць Гаграўскі, Бзыбскі, Кадорскі, Сванецкі, Лечхумскі, Рачынскі, Харульскі, Ламіскі, Картлійскі і інш. хрыбты. На Пд складкава-глыбавыя хрыбты Малога Каўказа (Месхецкі, Шаўшэцкі, Трыялецкі). На ПдУ Джавахецкае вулканічнае нагор'е з конусамі патухлых вулканаў, градамі, хрыбтамі (Джавахецкі хр.) і лававымі плато. Паміж Вял. і Малым Каўказам міжгорныя нізіны (Калхідская і інш.). Ліхскі хр. падзяляе Г. на Зах. і Усх. На З Г. абмываецца Чорным м. (308 км). Карысныя выкапні: марганец, каменны і буры вугаль, нафта, медзь, свінец, цынк, вальфрам, ртуць, барыт, бентанітавыя гліны, тальк, дыятаміт, андэзіт, кварцавыя пяскі, даламіт, мармур розных адценняў, вогнетрывалыя і керамічныя гліны, вапняк і інш. Калій 1300 мінер. крыніц (Баржомі, Цхалтуба, Саірме, Менджы і інш.). Клімат Г. вельмі разнастайны. На значнай частцы Г. ніжэй за 500 м субтрапічны з умерана халоднай зімой і гарачым доўгім летам. На ўзбярэжжы сярэднегадавая т-ра 14—15, студз. 5—7,

Дарога цераз Клухорскі перавал.




ГРУЗІНСКАЯ ССР, ЭКАНАМІЧНАЯ КАРТА
Апрацоўчая прамысловасць
Нафтаперапрацоўчая
Шклозна-папяровая
Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў
Лёгкая
Дрэваапрацоўчая
Харчовая
Здабыўная прамысловасць
Чорная металургія
Машынабудаванне і металаапрацоўка
Хімічная
Нафты
Медных руд
Барыту
Марганцавых руд
Поліметалічных руд
Мыш'яковых руд
Каменнага вугалю
Бурага вугалю
Крыніцы мінеральных водаў
Гідраэлектрастанцыі (тыс. квт)
ад 500 да 1000
ад 100 да 500
ад 100 да 100
Цеплавыя электрастанцыі
Гідраэлектрастанцыі, якія будуюцца
Нафтаправоды
Газаправоды
Марскія шляхі, адлегласці ў кіламетрах
Марскія порты
Рыбалоўныя порты
Заўвага. Лічбы прамысловых пунктаў паказаны па колькасці жыхароў у іх
Карта складзена і аформлена ў жніўні 1970г.
Падпісана да друку 25.XI–1970г.
Сельская гаспадарка
Агародніцтва, садоўніцтва, вінаградарства, малочная жывёлагадоўля (буйная рагатая жывёла)
Тытуневодства, плодаводства і шаўкаводства
Збожжавыя культуры (пшаніца), мясавольная і мясa-малочная жывёлагадоўля (авечкагадоўля і буйная рагатая жывёла)
Вінаградарства, садоўніцтва і шаўкаводства
Плодаводства, агародніцтва і збожжавыя культуры
Эфіраалейныя культуры
Вінаградзінкі
Кукуруза
Сланечнік
Цукровая бурачы
Шаўкаводства
Тытунь
Лясы
Тунг
Маса-воўнавая жывёлагадоўля на летнія і зімовыя пашы
МАШТАБ 1:3 000 000
Чорнае мора
Каспійскае мора
Грузія
Расія
Турцыя
Іран
Тбілісі
Батумі
Кутаісі
Сухумі
Гагры
Сочы
Цхінвалі
Зугдзіды
Поці
Рыбінск
Ярэвань
Ерэван
Ленінакан
Кіраваканан
Ахалцыхе
Ардагань
Карс
Артвін
Рыза
Трабзон
Самсун
Сінап
Амасья
Токат
Ордзу
Самара
Куйбышаў
Волгаград
Ростаў
Краснадар
Ставрополь
Грозны
Махачкала
Дербент
Баку
Кіраванабад
Ташкент
Алма-Ата
Фрунзе
Ашхабад
Душанбе
Самаркандзе
Бухара
Ургенч
Нукус
Мангышлак
Каспійскае мора
Аральскае мора
Каракумы
Кызылкумы
Прыкаспійская нізіна
Заходнесібірская нізіна
Усходнееўрапейская раўніна
Каўказ
Вял. Каўказскі хр.
Гал. Каўказскі хр.
Трыялецкі хр.
Месхецкі хр.
Шаўшэцкі хр.
Ліхскі хр.
Кадорскі хр.
Сванецкі хр.
Лечхумскі хр.
Рачынскі хр.
Харульскі хр.
Ламіскі хр.
Картлійскі хр.
Джавахецкі хр.
Малы Каўказ
Эльбрус
Казбек
Шхара
Ушба
Ельбрускі
Кюкюрт
Залёдскі
Карачаеўск
Цебердзінскае
Цебердзінскае вдхр.
Прыгородная
Зеленчукская
Мінеральные Воды
Рэжэво
Вел. Ябло
Кр. Поляна
Сочы
Гагры
Пасіка
Ахвацкае
Ахвацкае вдхр.
Ізумрудная
Ізумрудная вдхр.
Ажэрэлье
Ажэрэлье вдхр.
Ладжанурскае
Ладжанурскае вдхр.
Ціхарэцкае
Ціхарэцкае вдхр.
Ціхарэцкае вдхр.
Ціхарэцкае вдхр.



Тбілісі. Від на цэнтральную частку горада.

ліп. 22—23 °С; ападкаў 2000—2500 *мм* (Калхідская нізіна). На У клімат сухі, кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад 0 да —3, ліп. 24—25 °С; ападкаў 300—800 *мм* за год. Найбольш нізкія т-ры ў паўд. частцы Г. (да —35 °С, Джавахецкае нагор'е). У гарах вышынная пояснасць. У зах. частцы Гал. Каўказскага хр. снегавая лінія на выш. каля 3000 *м*, ва ўсх.— 3400 *м*. Есць ледавікі (найб. Лехзіры, даўжыня 13,6 км). Шмат рэк. Да бас. Каспійскага м. належаць Кура з прытокамі Алазані, Арагві, Ксані, Вял. Ліяхві, Храмі; да бас. Чорнага м.— Рыёні (з прытокамі Квірыла, Цхенісцкалі, Тэхуры і інш.), Чарох, Інгуры, Кадоры, Бзыб і інш. У Г. бярэ пачатак Церак. Жыўленне рэк мяшанае, пераважна ледавіковае. Энергарэсурсы рэк 18,2 млн. *кВт*; рэкі выкарыстоўваюцца і на арашэнне. Азёры Паравані, Палеастомі, Рыца. Цалкінскае, Тыбульскае і інш. вадасх. У прыморскай палосе і Калхідзе глебы субтрапічныя падзолістыя, балотныя і забалочаныя глеевыя. У Зах. Г. ў зоне перадгор'яў чырваназемы, жаўтаземы і часткова перагнойна-карбанатныя. У Зах. і Усх. Г. ў гарах бурыя і карычневыя лясныя глебы. У нізінах Усх. Г. чарназёмныя, каштанавыя і лугава-карычневыя алювіяльныя; у перадгорнай зоне карычневыя лясныя. На Пд горныя чарназёмы. У высакагорнай зоне горналугавыя глебы. Пад лесам 36,5% тэр. У Зах. Г. на Калхідскай нізіне і ў перадгор'ях да выш. 500 *м* шыракалістыя лясы (дуб, граб) з вечназялёным падлескам з лаўравішні, лаўру, самшыту, рададэндрану пантыйскага. На выш. 500—1500 *м* мяшаныя лясы, пераважна дубовыя, грабовыя, букавыя. Ад 1500—1600 да 2000 *м* ялова-піхтавы лес. На верхніх схілах гор у зах. частцы субальпійскія і альпійскія лугі. Ва Усх. Г. на нізінах сухая стэпавая і паўпустынная расліннасць. У гарах букавыя лясы, вышэй 1800—2000 *м* субальпійскія і альпійскія лугі. У горных лясах водзяцца мядзведзі, барсы, казулі і інш., з птушак ястрабы, каюкі; у гарах туры, казлы, у стэпах лісы, шакалы, зайцы. Створана 15 запаведнікаў (Рыцынскі, Баржомскі, Гумацкі, Лагадзехскі і інш.).

Насельніцтва. Грузін 66,8%; жывуць армяне, рускія, азербайджанцы, асеціны, абхазы, грэкі і інш. Сярэдняя шчыльн. 67,3 чал. на 1 *км*². Найб. населены міжгорныя нізіны, далiны рэк і хвалістыя перадгор'і — шчыльн. да 200 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 48%. Найбольшыя гарады: Тбілісі (889 тыс. ж., 1970), Кутаісі (161 тыс. ж.), Сухумі (102 тыс. ж.), Батумі (101 тыс. ж.).

Гістарычны нарыс. Тэр. Г. заселена з эпохі ранняга палеаліту. Тут выяўлены шматлікія археал. помнікі каменнага веку, эпох бронзы і жалеза. З сярэдзіны 2-га тысячагоддзя да н. э. пачаўся распад першабытнаабшчыннага ладу, на мяжы 2—1-га тысячагоддзяў да н. э. склаліся саюзы старажытнагруз. плямёнаў. У 6—4 ст. да н. э. ўзніклі грузінскае (Зах. Г.) і іберыйскае (Усх. Г.). З 1 ст. да н. э. Г. залежала ад Рыма. Феад. адносіны зараджаюцца ў 1—4 ст. н. э.; у 1-й пал. 4 ст. (каля 397) хрысціянства абвешчана афіц. рэлігіяй. У 5—6 ст. Г. змагалася супраць агрэсіі Ірана і Візантыі, у 7—9 ст.— супраць арабаў. На мяжы 8—9 ст. узніклі феад. царствы і княствы (самтвара), якія ў пач. 11 ст. ўз'яднаны ў адзіную феад. дзяржаву на чале з дынастыяй *Багратыёні*. 11—12 ст.— перыяд паліт. магутнасці, эканам. і культ. росквіту феад. Г., якая ў часы праўлення *Давіда Будаўніка* [1089—1125], Георгія III [1156—84] і Тамары [1184—1213] стала адной з наймагутнейшых дзяржаў Закаўказзя і Б. Усходу. Значнага ўздыму дасягнулі навука і культура. Г. падтрымлівала культурна-эканам. сувязі з Візантыяй, краінамі Захаду, арабскага Усходу і з Кіеўскай Руссю.

У 2-й чвэрці 13 ст. Г. заваявалі манголы. У выніку нашэсця Цімура ў 2-й пал. 14 ст. краіна заняпала, узмацнілася феад. раздробленасць. У канцы 15 ст. Г. распалася на незалежныя царствы — Картлійскае, Кахецінскае, Імерэцінскае і княства Самцхе — Саатабага. У 16 ст. ў Імерэцінскім царстве вылучыліся незалежныя княствы — Мегрэлія, Абхазія і Гурыя. У 16—18 ст. груз. народ вёў упартую барацьбу супраць агрэсіі Ірана і Турцыі. У 2-й пал. 18 ст. ўзмацніліся царствы Картлійска-Кахецінскае (Усх. Г.) і Імерэцінскае (Зах. Г.). Груз. цары прасілі дапамогі ў Расіі, дзе знаходзілі падтрымку і прыстанішча многія груз. паліт. і культ. дзеячы. Умацаванне рус.-груз. адносін прывяло да ўстанаўлення пратэктарату Расіі над Усх. Г. (гл. *Георгіеўскі трактат 1783*). У 1801 Усх. Г., у 1803—10 Зах. Г. далучаны да Расіі. Нягледзячы на калан. палітыку царызму, гэта мела прагрэс. значэнне ў паліт., сацыяльна-эканам. і культ. адносінах. Аднак прыгнёт царызму, прыгонніцтва няраз выклікалі масавыя сялянскія выступленні (1804 у Картлі, 1812 у Кахеты, у 1819—20 у Імерэты, у 1841 у Гурыі, у 1857 у Мегрэлі). У 1846 Г. падзелена на 2 губ.— Тыфліскую і Кутаіскую. З 30—40-х г. развіваецца дробнатаварная вытворчасць, узнікаюць мануфактурныя прадпрыемствы, павялічваецца гар. насельніцтва, Г. уключаецца ў агульнарасійскі рынак. Адмена прыгону ў Г. (1864—71) паскорыла развіццё капіталізму. Зараджаецца фабр.-заводская вытворчасць, развіваецца буд-ва чыгунак, горнарудная прамысловасць (асабліва здабыча чыатурскага марганцу), фарміруецца рабочы клас. У 1899 у Г. было больш за 2 тыс. прамысл. прадпрыемстваў, калі 18 тыс. рабочых. Развіццё капіталіст. адносін, паліт. і эканам. кансалідацыя Г. стварылі ўмовы для фарміравання груз. бурж. нацыі (гл. *Грузіны*).

У 60-я г. ў Г. ўзмацніўся нац.-вызв. рух на чале з рэвалюц. дэмакратамі І. Р. Чаўчавадзе, А. Р. Цэрэтэлі, М. Я. Нікаладзе і інш. У 70-я г. пачынаецца забастовачны рух на прадпрыемствах, ствараюцца рабочыя гурткі. З канца 90-х г. пад уплывам рэвалюц. сацыял-дэмакратаў рабочы рух набывае арганізаваны характар, а з пач. 20 ст. пераходзіць у масавую паліт. барацьбу супраць самаўладдзя і буржуазіі. Усерас. значэнне мела Батумская стачка і дэманстрацыя 1902. Працоўныя Г. пад кіраўніцтвам Каўказскага саюзнага к-та РСДРП актыўна ўдзельнічалі ў рэв. 1905—07. У студз. 1905 адбыліся ўсеагульныя забастоўкі ў Тыфлісе, Батумі, Кутаісі, Чыятурах. У Гурыі сялянскія камітэты адбіралі ў памешчыкаў зямлю, арганізоўвалі ўзбр. «чырвоныя сотні». У канцы 1905 значная частка Г. ахоплена ўзбр. паўстаннем. Рэпрэсіі царызму ў перыяд рэакцыі (1907—10) прычынілі вял. страты бальшавіцкім арг-цыям. У 1912 забастовачны рух узнаўляецца. У 1-ю сусв. вайну ў Г. адбылося да 40 буйных забастовак. Пасля Люг. рэв. 1917 уладу ў Г. захапілі меншавікі і эсэры. У сак. 1917 створаны орган бурж. Часовага ўрада — Асобы Закаўказскі к-т, у ліст. 1917 яго змянілі контррэвалюц. «Закаўказскі камісарыят». У маі 1918 меншавікі абвясцілі Г. «незалежнай рэспублікай» і стварылі ўрад, які прывёў краіну да паліт. і эканам. заняпаду, пайшоў на пагадненне з інтэрвентамі. У 1918 частка Г. адышла да Турцыі. У маі ў Г. ўступілі ням. войскі, у снеж. 1918 — ліп. 1920 краіну акупавалі англ. інтэрвенты.

Барацьбу груз. народа за Сав. ўладу ўзначалілі бальшавікі Г. 16.2.1921 створаны рэўкам Г., які папрасіў дапамогі ў Сав. Расіі. 11-я Чырв. Армія і атрады груз. паўстанцаў 25.2.1921 вызвалілі Тыфліс, скінулі меншавіцкі ўрад і ўстанавілі Сав. ўладу. 25.2.1922

1-ы Усегрузінскі з'езд Саветаў прыняў канстытуцыю Груз. ССР. 12.3.1922 Г. ўвайшла ў Закаўказскую федэрацыю (ЗСФСР) і ў складзе ЗСФСР 30.12.1922 — у СССР; з 5.12.1936 Г.— саюзная рэспубліка. У люг. 1937 на 8-м з'ездзе Саветаў Г. прынята новая канстытуцыя Груз. ССР.

За гады даваен. пяцігодак Г. ператварылася ў індустр. рэспубліку з перадавой сацыяліст. эканомікай і культурай; сфарміравалася груз. сацыяліст. нацыя. За 20 гадоў Сав. улады ў Г. пабудавана 815 прамысл. прадпрыемстваў, узнікла 30 новых галін прамысловасці, у т. л. машынабудаванне, вытворчасць ферасплаваў, здабыча і перапрацоўка нафты, лакафарбавая, шарсцяная, трыкатажная, кансервавая, эфіраалейная, чайная, хімічная. У 1940 аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці Г. перавысіў узровень 1913 у 10,2 раза. У Айч. вайну грузіны з іншымі народамі СССР гераічна змагаліся з ням.-фаш. захопнікамі, у т. л. ў партыз. атрадах на Беларусі, у Руху Супраціўлення на тэр. Зах. Еўропы. У баях супраць акупантаў удзельнічалі груз. нац. дывізіі. 55 тыс. грузін узнаг. баявымі ордэнамі СССР, 136 воінам з Г. прысвоена званне Героя Сав. Саюза. За поспехі ў гасп. і культ. буд-ве Груз. ССР у 1935 і 1966 узнаг. ордэнамі Леніна, у 1971 ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Камуністычная партыя, камсамол, прафсаюзы. Пашырэнне марксізма ў Г. пачалося ў 90-я г. 19 ст. Сярод першых прапагандыстаў былі і рус. сацыял-дэмакраты Ф. А. Афанасьеў, С. Я. Алілуеў, В. К. Курнатоўскі. У канцы 1892 афармілася першая груз. марксісцкая арг-цыя «Месаме дасі» («Трэцяя група»), у якой у 1895—98 стварылася рэвалюц. крыло (У. З. Кецхавелі, І. В. Сталін, А. Р. Цулукідзе). У 1901 утвораны Тыфліскі к-т РСДРП, у Баку пачала выдавацца першая груз. ленінска-іскраўская газета «Брдзола» («Барацьба»). У сак. 1903 І з'езд с.-д. арг-цый Каўказа аформіў Каўказскі саюзны к-т РСДРП. К-т выдаваў нелегальныя газеты на груз., арм. і рус. мовах. У. І. Ленін высока ацэньваў работу с.-д. арг-цый Закаўказзя па інтэрнац. згуртаванні працоўных. II (кастр. 1903) і III (май 1904) з'езды Каўказскага саюза РСДРП замацавалі перамогу бальшавізму ў закаўказскіх с.-д. арг-цыях. У ліст. 1904 у Тыфлісе адбылася 1-я канфер. бальшавіцкіх к-таў. У рэв. 1905—07 Каўказскі саюзны к-т і мясцовыя к-ты РСДРП узначалілі барацьбу працоўных Г. супраць царызму. III з'езд РСДРП (крас. 1905) характарызаваў парт. арг-цыі Каўказа як найб. баявыя арганізацыі партыі. Пасля Люг. рэв. 1917 бальшавікі Г. разгарнулі вял. работу па мабілізацыі працоўных на барацьбу за перамогу сацыяліст. рэвалюцыі. З 11(24).3.1917 выдавалася бальшавіцкая газ. «Кавказский рабочий». У ліп. 1917 у Тыфлісе афармілася самастойная бальшавіцкая арг-цыя. Да восені 1917 узніклі бальшавіцкія арг-цыі на месцах. 2—7(15—20).10.1917 адбыўся 1-ы краявы з'езд каўказскіх арг-цый РСДРП(б), які нацэліў масы на падрыхтоўку ўзбр. паўстання. У маі 1920 афармілася Камуніст. партыя (бальшавікоў) Г.; 3.6.1920 выйшаў першы нумар газ. «Камунісці» («Камуніст»). Бальшавікі Г. ўзначалілі ўзбр. паўстанне працоўных супраць меншавіцкага ўрада (11—12.2.1921) і з дапамогай РСФСР 25.2.1921 устанавілі ў Г. Сав. ўладу. Кампартыя Г. арганізавала груз. народ на пабудову сацыялізма, мабілізавала на дапамогу фронту ў Айч. вайну, стаяла на чале барацьбы за далейшае развіццё нар. гасп. рэспублікі пасля вайны. На 1.1.1971 кампартыя Г. налічвала 296 375 чл. і канд. у чл. КПСС.

У вер. 1917, паводле рашэнняў VI з'езду РСДРП(б) (1917), у Тыфлісе створаны саюз маладых сацыялістаў-інтэрнацыяналістаў «Спартак». Спартакаўскія арг-цыі ўзніклі ў многіх гарадах Г. У крас. 1919 у Тыфлісе адбылася канфер. груз. маладзёжных арг-цый саюза «Спартак», якая адыграла ролю І з'езду камсамола Г. 29.9.1919 у Баку нелегальна праведзена 1-я Закаўказская канфер. маладзёжных камуніст. саюзаў Г., Арменіі і Азербайджана, якая аб'яднала іх у Закаўказскую абл. арг-цыю Усерасійскага Камуніст. Саюза Моладзі. У жн. 1920 II з'езд камсамола арганізацыйна афарміў ЛКСМГ. Груз. камсамольцы разам з камуністамі змагаліся за Сав. ўладу ў Г. У 1932 за актыўны ўдзел у сацыяліст. буд-ве камсамол Г. ўзнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга рэспублікі. У Айч. вайну камсамольцы Г. актыўна ўдзельнічалі ў барацьбе з ворагам на фронце і ў тыле. 65 грузінам-камсамольцам прысвоена званне Героя Сав. Саюза, тысячы атрымалі баявыя ордэны і медалі. На пачатак 1971 у камсамоле Г. было 452 тыс. чл.

Першыя прафсаюзы ў Г. ўзніклі ў 1905. У ліст. 1906 арганізавана Цэнтр. бюро прафсаюзаў Тыфліса, якое аб'яднала 30 прафсаюзаў. У перыяд рэакцыі (1907—09) амаль усе прафсаюзы Г. разгромлены. Масавае стварэнне прафсаюзаў пачалося пасля Люг. рэв. 1917. 11—16.4.1919 адбыўся 1-ы з'езд прафсаюзаў Г. Уздым прафс. руху пачаўся з усталяваннем у Г. Сав. улады. У чэрв. 1921 на 1-й канфер. груз. прафсаюзаў створаны Савет прафсаюзаў Г. На 1.1.1971 прафс. Г. налічвалі 1486 тыс. чл. Прафсаюзы Г. маюць 194 клубы, Дамы і Палацы культуры, 267 б-к, 99 дамоў адпачынку, санаторыяў, пансіянатаў і турысцкіх баз.

Народная гаспадарка. Г.— рэспубліка з высокаразвітай прамысловасцю і с. гасп., асн. раён СССР па вырошчванні субтрапічных культур і чаю. За перадваенныя пяцігодкі створаны электраэнергетычная, электраметалург., нафтаперапр., машынабудаўнічая, папяровая, чайная, кансервавая прамысловасць. За пасляваенныя гады ўзніклі: чорная металургія, хім. прамысловасць, аўтамабілебудаванне, суднабудаванне, электравозабудаванне. Аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці ў 1969 павялічыўся ў параўнанні з 1940 у 7,6 раза. Энерг. база — пераважна ГЭС (найбольшыя Зема-Аўчальская, Рыёнская, Сухумская, Храмская, Ткібульская, Гумацкія, Ладжанурская). Будуецца (1971) самая магутная ў




Круцільны цэх Рустаўскага завода сінтэтычнага валакна.

Закаўказзі (1,6 млн. *квт*) Інгурская ГЭС. Ткварчэльская, Рустаўская, Тбіліская і інш. ЦЭЦ. У 1969 выпрацавана 8,3 млрд. *квт·гадз* электраэнергіі. Прыродны газ Г. атрымлівае з Паўн. Каўказа. Адна з асн. галін прамысловасці — марганцавая (раён Чыятуры). Вугальная прамысловасць (Ткібулі, Ткварчэлі, Ахалцыхе); здабыча барыту, андэзіту, дыятаміту, тальку, бентанітавых глінаў. У Батумі нафтаперапр. з-д, які атрымлівае нафту з Баку і Паўн. Каўказа. У Руставі металург. з-д поўнага цыкла, выпускае цэльнакатаныя трубы для нафтавай прамысловасці, сартавы пракат і інш. У 1969 выплаўлена 802 тыс. *т* чыгуну і 1380 тыс. *т* сталі. На Чыятурскім марганцы працуе Зестафонскі ферасплаўны з-д, прадукцыя яго пастаўляецца металург. прадпрыемствам СССР і экспартуецца. У Руставі з-д азотных угнаенняў, прадпрыемствы для вытворчасці капралактаму і сінт. валакна. У Кутаісі з-д літапону, у Батумі кафеінавы з-д, у Тбілісі фармацэўтычная прамысловасць. Цэнтр станкабудавання Тбілісі. Электратэхн. прамысловасць налічвае 22 прадпрыемствы (Тбілісі, Батумі, Сухумі, Цхінвалі, Поці і інш.). Транспартнае машынабудаванне (у Кутаісі аўтамаб. з-д, у Тбілісі электравозабудаўнічы, у Батумі суднабудаўнічы). У Тбілісі і Кутаісі с.-г. машынабудаванне (чаяўборачныя машыны, малагабарытныя трактары для горнага земляробства). Абсталяванне для чайнай, вінаробнай і кансервавай прамысловасці ў Тбілісі і Батумі. Прамысловасць буд. м. (у Руставі і Каспі цэментныя з-ды; цагельныя і чарапічныя з-ды). Прадпрыемствы лесапільнай, дрэваапр. (у Зугдыды цэлюлозна-папяровы камбінат), мэблевай прамысловасці. Шаўковая (Тбіліская шаўкаткацкая ф-ка, Кутаісі шаўковы камбінат, шоўкамат. ф-кі ў Махарадзе, Зугдыды, Кутаісі, Самтрэдыя, Цулукідзе, Тэлаві), шарсцяная (Тбіліскі камвольна-суконны камбінат, Кутаіская суконная ф-ка), баваўняная (баваўняны камбінат у Горы), гарбарная і абутковая (Тбілісі, Кутаісі, Батумі, Сухумі), дывановаткацкая (Міха Цхакая), швейная прамысловасць. Асн. галіны харч. прамысловасці — чайная, вінаробная, кансервавая, тытунёвая. Г. дае 95% чаю, які вырабляецца ў СССР. 77 чайных ф-к перапрацоўваюць 55—60 тыс. *т* чаю за год. У Тбілісі чаеразважвальная ф-ка. Вінзаводы выпускаюць сухія марачныя віны, шампанскае і каньякі. Кансервавая прамысловасць дае больш за 200 відаў кансерваў з садавіны і агародніны. Кансервавыя з-ды ў Горы, Кутаісі, Батумі, Самтрэдыя, Сухумі, Ахалцыхе і інш. Тытунёвыя ф-кі ў Тбілісі, Батумі, Сухумі. Асн. рыбалоўная база Поці. Развіта малочная, мясная, мукамольная, кандытарская прамысловасць, разліўка мінер. вады.

Пад с.-г. ўгоддзямі 2,82 млн. *га*. Worныя землі займаюць 27,5%, шматгадовыя насадкі 4,6, сенажаці і паша 61%. Ва Усх. Г. арашальнае земляробства. У 1968 было 326 тыс. *га* арашоных зямель. Будуецца (1971) Верхнеалазанская арашальная сістэма, якая пальe 108 тыс. *га* зямель і абводніць 50 тыс. *га* пашы. Асушаюцца землі ў Калхідскай нізіне. Усяго асушана 114 тыс. *га*. У Г. 1351 калгас і 199 саўгасаў (1969). Пасяўная пл. 747 тыс. *га* (1969). Асн. культуры чай (63,9 тыс. *га*), цытрусавыя (12,4 тыс. *га*, мандарыны, апельсіны, лімоны). Вырошчваюць хурму, файхоа, мушмулу, гранат, інжыр, масліны, лаўр, тунг, з якога вырабляюць высакаякасны тэхнічны алей. Вінаградарства (113 тыс. *га*) па схілах гор да выш. 1000 *м*. 140 тыс. *га* пад пладова-ягаднымі культурамі. Пад тэхн. культурамі 42 тыс. *га* (у т. л. пад тытунём 13 тыс. *га*, эфіраалейнымі 2,7 тыс. *га*, цукр. буракамі 3,9 тыс. *га*), вырошчваюць сланечнік. Пад збожжавымі 457 тыс. *га* (у т. л. пад пшаніцай 150 тыс. *га*, кукурузай 237 тыс. *га*). Пашураны агародніна-бахчавыя культуры. Асн. галіны жывёлагадоўлі — гадоўля авечак і буйн. раг. жывёлы. У 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 1503 (у т. л. кароў 606), авечак і коз 1923, свіней 582. Зімою з-за недахопу пашы значную частку авечак перагоняюць на Паўн. Каўказ. Авечкагадоўля пераважае ва ўсх. раёнах Г.

Сяло Нагамары калгаса «Сакартвела» Махарадзеўскага р-на.



Даўж. чыгунак 1415 *км* (1969), з іх 1385 *км* электрыфікавана. Гал. магістралі Баку — Тбілісі — Батумі з адгалінаваннямі на Махарадзе, Чыятуры, Поці, Цхалтуба, Ткібулі, Цхінвалі і інш.; Міха Цхакая — Сухумі — Туапсе. Шашэйных дарог 20,5 тыс. *км*, у т. л. 15,8 тыс. *км* з цвёрдым пакрыццём. Марскія порты Батумі, Поці, Сухумі.

Ахова здароўя. У рэсп. (1969) больш за 40 тыс. бальнічных ложкаў (9,8 на 1 тыс. ж.). У сістэме Мін-ва аховы здароўя 499 стацыянарных бальнічных устаноў, 72 дыспансеры, 14 мед.-сан. частак, больш за 1400 амбулаторый і паліклінік, 91 сан.-эпідэмічная станцыя, 89 бактэрыялагічных і вірусалагічных лабараторый, 3 ін-ты сан.-эпідэмічнага профілю, 2 вышэйшыя навуч. мед. ўстановы, 22 мед. НДІ. Працуе 17 116 урачоў (36 на 10 тыс. ж.). Агульная смяротнасць (у параўнанні з дарэвалюц. часам) паменшала. Сярэдняя працягласць жыцця насельніцтва 73 гады. У рэспубліцы 60 усесаюзных курортаў, больш за 90 санаторыяў (25 тыс. ложкаў), у т. л. 26 дзіцячых; 30 дамоў адпачынку, 15 пансіянатаў. Курорты: Баржомі, Цхалтуба, Абастумані, Гагра, Зялёны Мыс, Новы Афон. Да Кастр. рэвалюцыі было 50 бальніц. Працавала каля 350 урачоў і 500 чал. сярэдняга мед. персаналу (1 урач на 7400 ж. у горадзе і на 63 157 ж. у сельскай мясцовасці).

Народная асвета, навуковыя ўстановы. Да ўстанаўлення Сав. улады 75% насельніцтва Г. было непісьменным. У 1914/15 навуч. г. яна мела 1765 агульнаадук. школ усіх тыпаў (157,1 тыс. вучняў), 95% з іх — пач. школы, 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў, Тбіліскі політэхн. ін-т (адзіная ВНУ ў той час). Пры Сав. уладзе ў Г. ліквідавана непісьменнасць, ажыццёўлена ўсеагульнае абавязковае навучанне, створана сістэма вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі. У 1970 было 1718 дашкольных дзіцячых устаноў (на 114 тыс. дзяцей). У 1969/70 навуч. г. працавала 4585 агульнаадук. школ усіх тыпаў (1016,5 тыс. вучняў), 98 сярэдніх спец. навуч. устаноў (50,6 тыс. навучэнцаў), 18 ВНУ (90,1 тыс. студэнтаў). Найбольшыя ВНУ: *Тбіліскі універсітэт*, політэхн. ін-т імя Леніна, с.-г. ін-т, пед. імя Пушкіна, тэатральны ін-т імя Руставелі, Акадэмія мастацтваў. На пач. 1970 было 3407 масавых б-к (20 999 тыс. т.), самыя вялікія: Рэсп. б-ка імя Маркса, б-ка Тбіліскага ун-та, Фундамент. навук. б-ка АН Груз. ССР, Тбіліская навук. б-ка імя Джапарыдзе і інш.; 74 музеі (музей імя Джапаша, музей мастацтва і інш.), 1900 клубных устаноў, 1783 кінаўстаноўкі.

За гады Сав. улады груз. навука, якая вядзе свой пачатак са стараж. часоў, дасягнула вялікіх поспехаў. На пач. 1970 у Груз. ССР працавалі 194 навук. ўстановы: *Акадэмія навук Грузінскай ССР* (н.-д. ін-ты: фізікі; геафізікі; фіз. і арган. хіміі імя Мелікішвілі; горнай механікі, распрацоўкі радовішчаў і фізікі выбуху імя Цулукідзе; неарган. хіміі і электрахіміі; электронікі, аўтаматыкі і тэлемеханікі; кібернетыкі; механікі машын і палімерных матэрыялаў; металургіі; Тбіліскі матэматычны ін-т імя Размадзе; гісторыі груз. л-ры і інш.); н.-д. ін-ты — збудаванняў і гідраэнергетыкі імя Вінтэра; электроннай тэхналогіі; прыладабудавання і сродкаў аўтаматызацыі; праектна-тэхналагічны ін-т машынабудавання і электратэхнікі; садоўніцтва, вінаградарства і вінаробства; земляробства імя Ламауры; аховы раслін; пед. навук імя Гагебашвілі; клінічнай і эксперым. кардыялогіі імя Цынамдзгварышвілі; эксперым. і клінічнай хірургіі, Усесаюзны н.-д. ін-т чаю і субтрапічных культур, Запальны н.-д. ін-т тыпавога праектавання жылых і грамадскіх будынкаў, Закаўказскі н.-д. гідраметэаралагічны ін-т і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1969 у Г. выдавалася 146 газет, у т. л. рэсп. «Камуністсці» («Камуніст», на груз. мове), «Ахалгазрда камунісці» («Малады камуніст», на груз. мове), «Норчы ленінелі» («Малады ленінец», на груз. мове), «Літаратурулі Сакартвела» («Літаратурная Грузія», на груз. мове), «Сопліс цхаўрэба» («Сельскае жыццё», на груз. мове), «Заря Востока» (на рус. мове), «Савет Курчустаны» («Савецкая Грузія», на азерб. мове), «Саветакан Врастан» («Савецкая Грузія», на арм. мове) і інш., 121 часопіс і інш. перыяд. выданні. Кніжныя выдавецтвы: Выдавецтва ЦК кампартыі Грузіі, «Накадулі», «Сабчота Сакартвела», «Мецніерэба», «Хеловіеба», «Мерані», «Ганатлеба», «Алашара», «Ірыстон» і інш. У 1969 выдадзена 2302 кнігі тыражом 17 430 тыс. экз. Радыёвяшчанне на груз., рус., арм., азерб., абхазскай, асецінскай і інш. мовах. З 1956 працуе Тбіліскі тэлецэнтр.


Літаратура. У вуснай нар. творчасці грузін — міфы, паданні, легенды, песні, казкі і г. д. Шырока вядомыя эпас аб прыкаваным да скалы Каўказскага хрыбта багаборцы Аміран, сярэдневяковы эпас *«Этэрыяні»*.

Першыя помнікі груз. пісьмовай л-ры датуюцца 5—6 ст. Груз. л-ра 5—11 ст. пераважна рэлігійна-характару. У 12 ст. ўзнікае свецкая л-ра (раманы «Аміран-Дарэджаніані» і «Вісраміяні»). Вяршыняй тагачаснай паэзіі — «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш. *Руставелі*. Набегі манголаў (13—14 ст.), персаў і туркаў (15—16 ст.) надоўга затрымалі развіццё груз. л-ры. З пісьменнікаў 16—18 ст. вылучаюцца цары Тэймураз I, Арчыл II, Вахтанг VI, празаік і лексікограф Сулхан-Саба Арбеліяні, паэты Д. *Гурамішвілі* і Бесікі. Паэт-ашуг *Саят-Нова* (18 ст.) складаў песні на арм., груз. і азерб. мовах. У пач. 19 ст. Г. добраахвотна далучылася да Расіі. Паглыбіліся духоўныя кантакты з дзеячамі рус. культуры. Гэта выклікала глыбокія зрухі і абнаўленне ў груз. л-ры. У пач. 19 ст. выступілі паэты-рамантыкі А. Чаўчавадзе, Г. Арбеліяні, В. Арбеліяні і інш. Яны адлюстравалі ў сваёй творчасці думкі і пачуцці перадавых сіл грамадства, што змагаліся за сац. і нац. разняволенне. Вяршыняй груз. рамантызму стала паэзія Н. *Бараташвілі*. Рэаліст. кірунак (узнік у сярэдзіне 19 ст.) выявіўся ў камедыях Г. Эрыставі — заснавальніка новага груз. тэатра і рэаліст. драматургіі, у аповесцях Л. Ардазіяні і Д. Чанкадзе. Найвышэйшага развіцця крытычны рэалізм дасягнуў у творчасці І. *Чаўчавадзе* і А. *Цэрэтэлі*. Іх паплечнікамі былі Г. Цэрэтэлі і Н. Нікаладзе. У груз. л-ры 70—80-х г. пашырыліся ідэі народніцтва (Н. Ламауры, К. Габашвілі, С. Мгалаблішвілі і інш.). У 80-я г. паявіліся раманы і аповесці А. *Казбегі*, пачаў творчую дзейнасць *Важа-Пшавела*. На мяжы 19—20 ст., ва ўмовах абвастрэння класавых супярэчнасцей, пашырэння марксісцкага вучэння і ўзнікнення с.-д. арг-цый, цэнтр. месца ў груз. л-ры заняліпраблемы класавай барацьбы і сац. перабудовы жыцця.


Пісьменнікі-рэалісты Э. Ніпашвілі, Д. Клдыяшвілі, В. Барноў, Ш. Арагвіспірэлі праўдзіва паказвалі бязрадаснае жыццё сялян, эканам. і духоўны заняпад дваранства, паляўленне на вёсцы кулацтва, маральнае разлажэнне бурж. грамадства, выкрывалі заганы самадзярж. ладу. Рэвалюц. паэт І. Еўдашвілі першы ў груз. л-ры стварыў вобразы пралетарыяў. Песні на яго вершы спявалі на барыкадах рэвалюцыі 1905—07. Груз. л-ра горача адгукнулася на рэвалюцыю. Узнёслыя вершы ёй прысвяцілі А. Цэрэтэлі і Важа-Пшавела. Паражэнне рэвалюцыі выклікала ў пэўнай часткі інтэлігенцыі настроі расчаравання і безнадзейнасці. Яны адбіліся ў творчасці т. зв. «дэмакратычных паэтаў» — Н. Чхіквадзе, Г. Кучышвілі, А. Абашэлі і інш. У гады рэакцыі распаўсюдзіліся ўплывы мадэрнізму і дэкадэнцтва. Іх не ўніклі І. *Грышашвілі* і С. Шаншыяшвілі — пасля выдатныя прадстаўнікі груз. сав. л-ры, і нават Г. *Табідзе* — заснавальнік груз. сав. паэзіі. Падчас 1-й сусв. вайны выступіла група паэтаў-сімвалістаў «Блакітныя рогі». Рэаліст. традыцыі прадаўжалі Ч. Ламтатыдзе, Ш. *Дадыяні*, Н. *Лордкіпанідзе*, Л. *Кіячэлі*, дзіцячыя пісьменнікі Ш. Мгвімелі, Н. Накашыдзе, драматургі І. Гедэванішвілі, Т. Рамішвілі і інш. У гады рэакцыі і меншавіцкага рэжыму ў л-ру прыйшло першае паказанне груз. пралетарскіх паэтаў: С. Эулі, Н. Замлетэлі, І. Вакелі, І. Лісашвілі, П. Самсанідзе і інш.


Усталяванне Сав. улады ў Грузіі (1921) адкрыла новую эпоху ў гісторыі груз. л-ры. Першы перыяд яе развіцця вызначаўся рэзкай дыферэнцыяцыяй творчых сіл, вострай ідэалагічнай барацьбой. З першых дзён Сав. ўладу падтрымалі Г. Табідзе, Ш. Дадыяні, Г. Кучышвілі і інш. У л-ру ішлі маладыя сілы. Знаходзячыся на розных ідэйна-эстэт. пазіцыях, пісьменнікі аб'ядналіся ў розныя літ. арг-цыі і групоўкі. Толькі ў 2-й пал. 20-х г. найлепшыя прадстаўнікі аб'яднанняў выходзяць на шырокі шлях рэаліст. мастацтва, авалодваюць тэматыкай сацыяліст. рэчаіснасці. Гімнам сацыяліст. Айчыне сталі паэмы і лірычныя цыклы Г. Табідзе. Узоры паліт. лірыкі стварыў А. Мірцхулава (Машашвілі). Самабытна прагучаў голас К. *Каладзе*. Паэты П. Яшвілі, Т. *Табідзе*, Г. *Леанідзе*, В. Гапрындашвілі, К. Надзірадзе і інш., адыходзячы ад сімвалізму і перамагаючы наносныя ўплывы дэкадэнцтва, напісалі шэраг яркіх твораў пра сав. рэчаіснасць. Наватарскія вершы С. *Чыкавані* адлюстроўвалі істотныя змены ў розных сферах жыцця сав. народа. Па-новаму загучала творчасць паэтаў, якія сфарміраваліся яшчэ да рэвалюцыі (Грышашвілі, Абашэлі, Шаншыяшвілі, Кучышвілі, К. Чычынадзе). У л-ру прыйшлі І. *Абашыдзе*, А. Гаміяшвілі, К. Качахідзе. Адрадзілася проза (раманы і аповесці Ш. Дадыяні, Д. Шэнгелая, М. Джавахішвілі, Л. Кіячэлі, Н. Лордкіпанідзе) і драматургія (п'есы Ш. Дадыяні, Шаншыяшвілі, П. Какабадзе). У 30-я г. ў груз. л-ры канчаткова замацаваўся сацыяліст. рэалізм як асн. творчы метад. Поспехаў дасягнула паэзія (Г. Табідзе, Т. Табідзе, Яшвілі, Леанідзе, Г. *Абашыдзе*, І. Абашыдзе). Першымі значнымі кнігамі пра калгасную вёску былі раманы К. *Лордкіпанідзе* і Л. Кіячэлі. Гістар. тэматыку распрацоўвалі ў раманах і аповесцях К. *Гамсахурдыя*, Шэнгелая, А. Кутатэлі, Джавахішвілі, І. Лісашвілі, Б. Чхеідзе, Д. Суліяшвілі. Кніга К. Лордкіпанідзе «Беларускія апавяданні» і павелы Р. Гветадзе — на тэмы гераічнай гісторыі бел. народа. Эпізоды рэвалюц. барацьбы груз. народа, характэрныя рысы духоўнага свету сав. чалавека раскрылі ў п'есах П. Какабадзе, С. Клдыяшвілі, І. Вакелі, Г. Баазаў. У гады Айч. вайны створаны эпічныя паэмы С. Чыкавані, Г. Абашыдзе, патрыят. лірыка І. Абашыдзе, Г. Табідзе, Г. Леанідзе, А. Мірцхулавы, Д. Гачэчыладзе, гістар. драмы С. Шаншыяшвілі і Л. Готуа. Барацьба сав. народа супраць гітлераўцаў — тэма п'ес Г. Мдывані, Г. Шатберашвілі і інш. Асн. месца ў груз. л-ры 50—60-х г. належыць прозе (К. Гамсахурдыя, А. Беліяшвілі, К. Лордкіпанідзе, Р. Джапарыдзе, Г. Абашыдзе, Т. Данжашвілі, В. Аваліяні, Г. Натрашвілі і інш.). Паэзія глыбей пранікае ў духоўны свет сав. чалавека, шматгранна паказвае дасягненні народа ў камуніст. буд-ве (І. Абашыдзе, Г. Леанідзе, С. Чыкавані, Р. Маргіяні, І. Нанешвілі і інш.). Створаны шэраг драм, лірычных і сатыр. камедый (М. Мрэўлішвілі, М. Бараташвілі, М. Джапарыдзе, І. Вакелі, В. Кандэлакі, Г. Хухашвілі). Развіваецца дзіцячая л-ра (Н. Накашыдзе, Марыджан, Р. Коркія, Н. Чачава). Праблемы развіцця сав. л-ры распрацоўваюць Г. Джыбладзе, С. Чылая, Ш. Радыяні, Б. Жгенці, Г. Натрашвілі, Л. Каландадзе, гісторыі груз. класічнай л-ры — К. Кекелідзе, Ш. Нуцубідзе, А. Барамідзе, А. Гецэрэлія і інш.


Сталыя кантакты паміж бел. і груз. пісьменнікамі пачаліся з 30-х г. 20 ст. Беларусь наведалі Жгенці, Джавахішвілі, Б. Буачыдзе, К. Лордкіпанідзе, Гветадзе, Кутатэлі, Дадыяні і інш. У Грузіі пабывалі Я. Купала, Я. Колас, П. Броўка, П. Глебка, М. Лынькоў, Э. Самуйлёнак, М. Хведаровіч, Б. Мікуліч, В. Вольскі і інш. Пра жыццё груз. народа напісаны раман «Будучыня» Самуйлёнка, аповесць «Дружба» Б. Мікуліча. У снеж. 1937 па Беларусі адзначана 750-годдзе паэмы Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры». Час. «Полымя рэвалюцыі» (1937, № 12) змясціў урыўкі з паэмы ў перакл. Хведаровіча, Броўкі, А. Гурло, А. Александровіча, артыкулы пра Руставелі. У чэрв. 1940 Я. Купала ўзнагар. Ганаровай граматай Вярх. Савета Груз. ССР за пераклады твораў А. Цэрэтэлі і папулярызацыю груз. л-ры ў БССР. Грузіі прысвечаны вершы Я. Купалы «Грузіі», «Сонечнаму Шата Руставелі», «Генацвале», Я. Коласа «Жыве Руставелі», А. Жаўрука «Вялікаму Шата», Броўкі «Грузінская песня», М. Танка «Грузінскі пейзаж», цыклы вершаў у зб. Хведаровіча «Усім сэрцам», А. Лойкі «Блакітнае азерца» і інш. У Грузіі выдадзены «Выбранае» Я. Купалы (1955), раманы І. Шамякіна «Глыбокая плынь» (1958), Броўкі «Калі зліваюцца рэкі» (1963), аповесць В. Зуба «Таямнічы надпіс» (1964), зб. «Беларускія апавяданні» (1961), «Беларуская савецкая паэзія» (1967). На груз. мову перакладзены вершы М. Аўрамчыка, Р. Барадуліна, Броўкі, Г. Бураўкіна, В. Віткі, С. Гаўрусёва, Глебкі, С. Грахоўскага, У. Дубоўкі, К. Кірэенкі, Я. Коласа, А. Куляшова, Я. Купалы, П. Макаля, П. Панчанкі, А. Пысіна, А. Русецкага, Танка, В. Таўлая і інш., апавяданні Я. Брыля, З. Бядулі, І. Грамовіча, П. Кавалёва, Я. Коласа, У. Краўчанкі, Лынькова, Я. Маўра, І. Мележа, А. Пальчэўскага, К. Чорнага, А. Якімовіча і інш. На бел. мове выйшлі: «Грузінскія казкі» (1962), зб. апавяданняў груз. дзіцячых пісьменнікаў «Твае грузінскія сябры» (1964), раманы Ц. Данжашвілі «На Алазані» (1959), А. Кутатэлі «Тварам у твар» (1936), К. Лордкіпанідзе «Далоў кукурузную рэспубліку» (1936) і зб. яго апавяданняў «Бяссмерце» (1941), паэма Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры» (1966, пер. А. Звонака і Хведаровіча), зб. апавяданняў груз. сав. пісьменнікаў «Горны вадаспад» (1967), зб. вершаў М. Гелавані «Клятва» (1970). У бел. прэсе друкаваліся пераклады твораў Н. Бараташвілі, Беліяшвілі, Важы-Пшавелы, М. Гелавані, А. Гаміяшвілі, Грышашвілі, Гурамішвілі, Каладзе, О. Іаселіяні, Д. Кіцарыдзе, Кутатэлі, Леанідзе, М. Лебанідзе, І. Масашвілі, Н. Нанешвілі,












Грузінская ССР I.

1. Ваенна-Грузінская дарога.
2. Гара Казбек.
3. Політэхнічны інстытут у Тбілісі.
4. Адкрытыя кар'еры Маднеульскага радовішча медзі.
5. Шахцёрскі горад Ткібулі.
6. Збор чаю на плантацыях Інгірскага саўгаса.
7. Рустаўскі металургічны завод.


1


2



3



4


5


6

Грузінская ССР II. 1. Храм Джвары. 586 (587)—604. 2. Дойлід Арсукідзе. Сабор Светы-Цхавелі ў Мцхеце. 1010—1029. 3. Г. І. Габашвілі. П'яны хеўсур. 1899. 4. Г. Д. Гелавані. Сям'я з Душэты. 1965. 5. В. Б. Тапурыдзе. Перамога. Скульптура на будынку тэатра ў Чыятуры. 1947. 6. С. С. Кабуладзе. Нестан Дарэджан. Іл. да паэмы Шата Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры». 1936—37. 7. Г. І. Лежава, В. Дз. Какорын і інш. Дом урада Грузінскай ССР у Тбілісі. 1953. 8. Курзал курортнага комплексу «Піцунда».


7


8

Л. Салакауры, Ф. Халвашы, С. Чыкавані і інш. груз. пісьменнікаў.

Архітэктура. Найб. стараж. помнікі — гарадзішча Урбісі (энеаліт), Нацар-гара ў Цхінвалі, курганы Трыялеты, Самтаура (эпоха бронзы і жалезнага веку), акропаль *Мцхеты*, скальныя збудаванні (ранняя памяшканні пячорнага горада Уплісцыхе). З 1-й пал. 4 ст., з прыняццем хрысціянства і пачаткам развіцця феад. адносін, будуюцца ўмацаваныя гарады (Уджарма, Тбілісі) і храмы: базілікі (Балійскі Сіён, 478—93, і інш.), з 6 ст. пераважна цэнтр.-купальныя храмы (Джвары, 586/87—604, прататып шэрагу цэркваў; Цромі, 7 ст.; Вана, 7 ст.). Першы росквіт груз. архітэктуры (2-я пал. 6 — 1-я пал. 7 ст.) вызначаецца строгім стылем, гарманічнасцю прапорцый, ураўнаважанымі формамі. Затармажанае араб. панаваннем будаўніцтва зноў разгортваецца ў 8—9 ст. (сабор у Самшвілдэ, ц. Квела-Цмінда каля Вачнадзіяні і інш.), пачынаецца новы росквіт архітэктуры (сярэдзіна 10—пач. 13 ст.). Разрастаюцца Тбілісі, Кутаісі, Дманісі і інш., будуюцца масты, манастырскія комплексы, храмы (прамавугольныя ў плане крыжова-купальныя будынкі з высокім барабанам і конусападобным дахам, аздобленыя разьбою і роспісам). Найб. значныя помнікі: храмы ў Ошкі (958—961), Кумурда (964), *Светы-Цхавелі* ў Мцхеце (1010—29, арх. Арсукідзе), *Алаверды*, храм Баграта ў Кутаісі, храмы Самтавісі, Нікарцмінда (усе 11 ст.), Гелацкі манастыр (пач. 12 ст.), пячорныя манастыры Давід Гарэджа, Вардзія і інш. Дойлідства 14—18 ст. зберагае нац. традыцыі, але яго маст. ўзровень зніжаецца. Найб. значныя збудаванні — замкі (Ананury і інш.), гарадзішча Грэмі, шэраг крэпасцяў. З далучэннем да Расіі ў архітэктуру пранікае класіцызм. У сав. час разгарнулася рэканструкцыя гарадоў, ствараюцца шматлікія жылыя дамы і буйныя грамадскія збудаванні. Сярод іх: комплекс Зема-Ачальскай ГЭС каля Мцхеты (1927, арх. А. Кальгін, М. Мачаварыяні, К. Лявонцьеў), стадыён «Дынама» (1933—37, А. Курдыяні), Дом урада (1938—53, В. Какорын, Г. Лежава), Палац спорту (1961, У. Алексі-Месхішвілі, Ю. Касрадзе, інж. Д. Каджана), мост імя Бараташвілі (1965, арх. Ш. Каўлашвілі, В. Куртышвілі, інж. Г. Карцывадзе), гасцініца «Іверыя» (1967, А. Каландарашвілі, І. Цхамелідзе), Груз. с.-г. ін-т (1967, У. Алексі-Месхішвілі, Г. Габашвілі), кінаканцэртная зала Груз. філармоніі (1971, І. Чхенкелі), станцыі метрапалітэна — усе ў Тбілісі; т-ры ў Кутаісі, Чыятуры, Сухумі, санаторыі ў Цхалтуба, Гагры, Піцундзе, Сухумі і інш. Іл. гл. на ўклейцы.

Выяўленчае і дэкаратыўнае мастацтва. Да 2—1-га тысячагоддзяў да н. э. адносяцца аздабленні і посуд з золата, серабра, бронзы, кераміка з глянцаваннем і роспісам (курганы Трыялеты, Самтаўрскі могільнік, Мцхета). У сярэднія вякі пашырана дэкар. скульптура (рэльефы Джвары, 7 ст.; Анізы, 9 ст.; Кумурда, Ошкі, 10 ст.; Светы-Цхавелі; разьба на алтарных апсідах з Сафары, Хоўле, 11 ст.), манументальны жывапіс (роспісы ў Атэні, Вардзіі, Кінцвісі, у цэрквах Сванеты; мазаіка гал. храма Гелацкага манастыра), мініяцюра (1-е і 2-е Джруцкія евангеллі, 940 і 12 ст.; Астр. трактат, 1188; Моквійскае евангелле, 1300), чаканка па метале (абразы «Праабражанне», 9 ст., і «Замілаванне»,11 ст., Зарама; залатыя крыжы з Брылі і Бэты, чаша з Бедыі — усе 10 ст.; Хахульскі складзень, 1-я пал. 12 ст.; творы Бекі і Бешкена Апізары, 2-я пал. 12 ст.). У 19 ст. значны ўплыў зрабіла рус. мастацтва. Развіваюцца партрэт (Г. Майсурадзе) і бытавы жанр, якія пераважалі ў творчасці мастакоў дэмакр. рэаліст. кірунку 2-й пал. 19 — пач. 20 ст.: Р. Гвелесіяні, А. Берыдзе, А. Гагіяшвілі, Г. *Габашвілі*, А. Мрэўлішвілі, М. Таідзе. На мяжы 19—20 ст. працуюць заснавальнік сучаснай груз. скульптуры Я. *Нікаладзе* і таленавіты жывапісец-самавучка Н. *Пірасманішвілі*. На сав. час прыпадае росквіт выяўл. мастацтва Грузіі. Вялікая роля належыць створанай у 1922 Тбіліскай АМ. Сярод мастакоў: жывапісцы і графікі А. Цыкурыдзе, В. Сідамон-Эрыставі, Л. Гудыяшвілі, Д. Какабадзе, А. Ахвледыяні, К. Магалашвілі, скульптары М. Кандэлакі, С. Какабадзе, Ш. Мікатадзе, В. Тапурыдзе, К. Мерабішвілі, скульптар і графік Т. Абакелія, жывапісец У. *Джапарыдзе*, графікі І. Габашвілі, С. Кабуладзе, І. Таідзе. Асабліва развілося тэатр.-дэкарацыйнае мастацтва: І. Гамрэкелі, С. Вірсаладзе, Дз. Тавадзе, П. Лапіяшвілі. У 50—60-я г. вылучыліся жывапісцы Г. Гелавані, З. Ніжарадзе, Т. Мірзашвілі, Г. Татыбадзе, Д. Хахуташвілі, графікі А. Бандзеладзе, Т. Кубанейшвілі, Д. Нодыя, Р. Тархан-Маўраві, скульптары-манументалісты З. Амашукелі, М. Бердзенішвілі, Г. Кардзахія, у станковай і дэкаратыўнай пластыцы — І. Акрапідзе, Т. Асатыяні, В. Аніяні. Адраджаецца мастацтва чаканкі (І. Ачылуры, Г. Габашвілі, К. Гурулі, І. Калва). Іл. гл. таксама на ўклейцы.



І. М. Таідзе. Радзіма-маці кліча! Плакат. 1941.

Музыка. Пра даўнасць груз. музыкі сведчаць знойдзеныя пры археал. раскопках муз. інструменты 2-га і 1-га тысячагоддзяў да н. э. і звесткі пра песні ў асірыйскіх і старагрэч. крыніцах (8 і 4 ст. да н. э.). Працоўныя, абрадавыя, бытавыя, гераічныя, эпічныя, танц. песні разнастайныя па форме, сродках муз. выразнасці. Грузіны стварылі самабытныя 2-, 3-, 4-галосыя спевы з багатай гарманічнай і поліфанічнай асновай. З муз. інструментаў бытуюць: саінары, саламуры, гудаствіры, чыбоні, сакэвіры (духавыя), чылянуры, чуніры (смыковыя), чангі, пандуры, чонгуры (шчыпковыя), долі, дайра, дыпліпіта (ударныя). Пасля прыняцця хрысціянства ў 4 ст. зарадзіліся царк. спевы (дайшлі да нашага часу ў трохгалоссі). Сярод прафесійных царк. музыкантаў вылучыўся тэарэтык і кампазітар 10 ст. М. Мадрокілі, аўтар абору духоўных гімнаў, запісаных спец. нотнымі знакамі. На 12 ст. прыпадае палўленне шматлікіх харавых і інстр. ансамбляў, росквіт выканальніцтва. З муз. дзеячаў больш позняга часу — С. С. Арбеліяні (1658—1725), які абнародаваў груз. муз. тэрміны, І. Багратыёні (1768—1830), аўтар муз. граматы асобнай сістэмы. Пасля далучэння Грузіі да Расіі пачалося збліжэнне груз. музыкі з еўрап. мастацтвам. У 30-я г. ствараюцца літ.-муз. салоны, развіваецца хатняе музіцыраванне. У 1851 у Тыфлісе спектаклем італьян. трупы адкрываецца оперны т-р, пазней ставяцца рус. оперы, наладжваюцца сімф. і камерныя канцэрты. Хар. і муз. курсы, арганізаваныя ў 1873 Х. Саванелі і А. Мізандары, пераўтвараюцца ў вучылішча (1886), потым у кансерваторыю (1917). З 60-х г. запісваюцца і публікуюцца нар. песні, Л. Агніяшвілі стварае этнагр. хор (1885). М. Баланчывадзе (гл. Мелітон Антона-

Бека Апізары. Абклад Анчыйскага абраза. Дэталь. 1105 (злева). Н. Пірасманішвілі. Алень на фоне пейзажу. 1913. Абодва ў Дзярж. музеі мастацтваў Грузінскай ССР. Тбілісі.





віч у арт. *Баланчывадзе*), І. Каргарэтэлі пішуць першыя рамансы. У пач. 20 ст. арганізавана Груз. філарманічнае т-ва (1905), расшырылася сетка муз. асветы, развіваецца хар. музыка (М. Сулханішвілі), ствараецца нац. опера (З. *Паліашвілі*, Дз. *Аракішвілі*, М. Баланчывадзе, В. Далідзе). У сав. перыяд груз. музыка ўзбагачаецца жанрамі сімфоніі, сімф. паэмы, кантаты, араторыі, балета, інстр. канцэрта, квартэта, у якіх працуе большасць сучасных кампазітараў: А. Андрыяшвілі, А. Баланчывадзе (гл. Андрэй Мелітонавіч у арт. *Баланчывадзе*), Р. Габічвадзе, Н. Габунія, А. Гардэлі, Б. Квернадзе, А. Керэселідзе, Р. Кіладзе, Р. Лагідзе, А. Мачаварыяні, Ш. Мшвелідзе, С. Насідзе, А. *Тактакішвілі*, Д. Тарадзе, І. Тускія, С. Цінцадзе, А. Чымакадзе, А. Шаверзашвілі і інш. Створаны дзіцячыя оперы (А. Букія, В. Гакіелі, М. Давіташвілі і інш.), муз. камедыі (Ш. Міларава і інш.). У развіцці груз. муз. навукі ўдзельнічалі Аракішвілі, Г. Арджанікідзе, Ш. Асланішвілі, У. Данадзе, П. Хучуа, Р. Чхіквадзе. Сярод груз. выканаўцаў: спевакі П. і М. Аміранашвілі, Д. і Н. Андгуладзе, З. Анджапарыдзе, Д. Бадрыдзе, В. Бахуташвілі-Шульгіна, Д. Гамрэкелі, С. Інашвілі, Ф. Карыдзе, Б. Кравейшвілі, М. Кумсіяшвілі, Дз. Мчэдлідзе, М. Накашыдзе, В. Сараджышвілі, К. Сахадзе, Н. Харадзе, Л. Чконія; дырыжоры Ш. Азмайпарашвілі, А. *Дымітрыядзі*, Л. Кіладзе, Я. Мікеладзе, Д. Мірцхулава, В. Паліяшвілі, І. Паліяшвілі, З. Хуродзе; піяністы Э. Вірсаладзе, М. Гаглідзе; скрыпачы Л. Ісакадзе, М. Яшвілі, Н. Яшвілі; у балетным мастацтве вылучыўся В. *Чабукіані*. У Тбілісі працуюць: т-р оперы і балета імя З. Паліяшвілі, т-р муз. камедыі імя В. Абашыдзе, сімф. аркестр, камерны аркестр, смыковы квартэт, хар. капэла, Дзярж. ансамбль песні і танца, Дзярж. ансамбль танца, хар. калектывы, эстрадныя інстр. і вак. ансамблі. У распублікі шмат муз. вучылішчаў і школ. Саюз кампазітараў Г. засн. ў 1932.

Тэатр. Тэатралізаваныя відовішчы існавалі ў Грузіі ў 3—2 ст. да н. э. Вытокі груз. т-ра ў рытуальных святах, у стараж. імправізацыйным нар. т-ры масак (берыкаоба) і сярэдневяковым палацавым т-ры (сахіоба). У 2-й пал. 18 ст. ўзнік школьны т-р, у 90-я г. сведкі т-р на чале з Г. Авалішвілі (існаваў да 1795). У 1-й пал. 19 ст. асн. формай тэатр. жыцця былі аматарскія гурткі, у 1845 створаны рус. драм. т-р. Заснавальнік адроджанага ў 1850 груз. прафесійнага т-ра — драматург Г. Эрыставі (у 1856 т-р закрыты). У 1879 пісьменнікі І. Чаўчавадзе і А. Цэрэтэлі зноў стварылі прафес. т-ры ў Тыфлісе і Кутаісі. Сярод найбуйнейшых тагачасных груз. акцёраў і рэжысёраў В. *Абашыдзе*, У. *Алексі-Месхішвілі*, Н. Габунія, М. Сапарава-Абашыдзе, К. Кіпіяні, К. Месхі, В. Гунія і інш. У перыяд актывізацыі прагрэс. руху ў 90-я г. ў Тыфлісе, Батуме, Кутаісі ствараюцца нар. т-ры. Асабліва значны быў кутаіскі т-р на чале з Алексі-Месхішвілі. У гады меншавіцкага панавання тэатр. мастацтва перажывае крызіс. Пасля ўсталявання Сав. улады пачаўся ўздым нац. т-ра. Вял. значэнне мела дзейнасць К. *Марджанішвілі* і яго вучня А. *Ахметэлі*, якія смела звярталіся да сусв. класічнай драматургіі, да гісторыка-рэвалюц. тэмы, дасягалі ў сваіх спектаклях сінтэзу рэалізму і гераічнай рамантыкі («Разбойнікі» Ф. Шылера, «Фуэнтэ авехуна» Лопэ дэ Вэгі, і інш.). У 1921 арганізаваны т-р імя Руставелі ў Тбілісі, у 1928 у Кутаісі створаны т-р пад кіраўніцтвам Марджанішвілі (у 1930 пераведзены ў Тбілісі, з 1933 імя Марджанішвілі). У 30—40-я г. ў груз. т-ры працавалі Ш. Гамбашыдзе, М. Гацырыдзе, Л. Чэркезішвілі, У. Чхеідзе і інш. Сярод выдатных дзеячаў груз. т-ра: нар. артысты СССР В. Анджапарыдзе, А. Васадзе, В. Гадыяшвілі, Г. Давіташвілі, А. Жаржаліяні, С. *Закарыядзе*, П. Кабахідзе, Г. Сагарадзе, С. Такаішвілі, А. *Хараба*, Т. Чаўчавадзе і інш. У 1939 створаны Груз. тэатр. ін-т імя Руставелі. У 50—60-я г. ў т-р прыйшлі акцёры і рэжысёры Г. і М. Гегечкоры, М. Джапарыдзе, А. Іаселіяні, Р. Лордкіпанідзе, Э. Магалашвілі, Э. Манджгаладзе, К. Махарадзе, М. Туманішвілі, М. Чахава і інш. У 1969 у Грузіі працавалі 23 драм. т-ры — 10 у Тбілісі (з іх т-р імя Руставелі, т-р імя Марджанішвілі, рус. т-р імя Грыбаедава, т-р арм. драмы імя Шаўмяна, рус. і груз. т-ры юнага гледача), т-ры ў Кутаісі, Сухумі, Горы, Батумі, Махарадзе, Поці і інш. У груз. т-рах сталіся бел. п'есы: «Гута» Р. Кобеца ў 30-я г. (Кутаіскі ТРАМ), «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона (Тэлаўскі т-р імя Арджанікідзе, 1949; Тбіліскі рус. т-р юнага гледача, 1949; Пацінскі т-р імя Гунія, 1950), «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы (Тбіліскі рус. т-р імя Грыбаедава, 1952).

Кіно. Дакумент. эдымкі А. Дыгмелава (1910) і В. Амашукелі (1912) далі пачатак груз. кінематаграфіі. У 1919 выйшаў маст. фільм «Хрыстына». Вялікая роля ў станаўленні сав. груз. кіно належала рэжысёрам А. *Бек-Назараву*, З. Берышвілі, Г. Макараву, К. Марджанішвілі, І. Перэстыяні, А. Цуцунаве і інш. Сярод першых фільмаў: «Арсен Джарджыяшвілі» і «Чырвоныя чарцяняты» (1921, 1923, рэж. Перэстыяні), «Каля ганебнага слупа» («Бацьказабойца», 1924, Бек-Назараў), «Тры жыцці» (1925, Перэстыяні), «Мачаха Саманішвілі» (1927, Берышвілі і Марджанішвілі), «Элісо» (1928, М. Шэнгелая). Этапным для кіно Г. стаў этнагр. фільм «Соль Сванетыі» (1930, М. Калатозаў). Фільмы 30-х г.: «Хабарда», «Апошні маскарад» і «Арсен» (1931, 1934, 1937, рэж. М. Чыяўрэлі), «Да хуткага спаткання» (1935, Макараў), «Страчаны рай» (1938, Д. Рандэлі). У Айч. вайну створана гістар. эпапея «Георгій Саакадзе» (1942—43, Чыяўрэлі). З пасляваен. фільмаў: «Страказа» (1954, С. Далідзе), «Лурджа Магданы» (1956, Р. Чхеідзе і Т. Абуладзе), «Наш двор» (1957, Чхеідзе), «Баш-ы-ачук» (1957, Л. Эсакія), «Атарава ўдава» (1958, Чыяўрэлі), «Чужыя дзеці», «Я, бабуля, Ілiко і Іларыён» і «Маленне» (1959, 1962, 1969, Абуладзе), «Вяселле» і «Парасон» (1965, 1967, М. Кабахідзе), «Лістапад» (1966, А. Іаселіяні), «Не бядуй!» (1970, Г. Данелія, «Масфільм» з удзелам «Грузія-фільм»), «Незвычайная выстаўка» (1970, Э. Шэнгелая). Найб. значны груз. фільм «Бацька салдата» (1965, Чхеідзе). На студыі навук.-папулярных і хранік. фільмаў шэраг значных стужак стварыў рэж.-аператар Г. Асатыяні («Рознапавярховая Амерыка», 1961; «Алжырскі дзённік», 1962; «Гэта Грузія», 1967).

Літ.: Ленін У. І. Таварышам-камуністам Азербайджана, Грузіі, Арменіі, Дагестана, Горскай рэспублікі, Тв., т. 32 (Полн. собр. соч., т. 43); История Грузии, [кн.] 1, 3, Тбилиси, 1962—68; Страницы из истории Грузии, Тбилиси, 1965; Очерки истории Коммунистической партии Грузии, ч. 1—2, Тбилиси, 1957—63; Меликишвили Г. А. К истории древней Грузии, Тбилиси, 1959; Апакидзе А. Города древней Грузии, Тбилиси, 1968; Антелава И. Г., Орджоникидзе Э. А. и Хоштария Э. В. К вопросу о генезисе и развитии капитализма в сельском хозяйстве и промышленности Грузии, Тбилиси, 1967; Гугушвили П. В. Развитие промышленности в Грузии и Закавказье в XIX—XX вв., т. 1, Тбилиси, 1957; Махарадзе Н. Б. Победа социалистической революции в Грузии, Тбилиси, 1965; Натмеладзе М. В. и Стуруа Н. И. Из истории рабочего класса Грузии (1921—1953), Тбилиси, 1961; Грузия. Краткий исторический очерк, Тбилиси, 1966; Грузинская ССР к пятидесятилетию Великой Октябрьской социалистической революции (Библиогр. указатель), Тбилиси, 1967; Грузии сыны, М., 1961 (Жизнь замечательных людей); Грузия, М., 1967 (Советский Союз); Гвелесиани Г. Г. Развитие и размещение социалистического производства в Грузинской ССР, Тбилиси, 1965; Барамидзе А., Радиани Ш. и Жгенти В. История грузинской литературы, Тбилиси, 1958; Чилая С. Очерки истории грузинской советской литературы, пер. с груз., Тбилиси, 1960; Джибладзе Г. Романтики и реалисты в грузинской литературе XIX века, пер. с груз., Тбилиси, 1963; Жгенці В. Грузінская савецкая літаратура, «Беларусь», 1950, № 3; Амиранашвили Ш. Я. История грузинского искусства, М., 1963; Ягоо ж. История грузинской монументальной живописи, т. 1, Тбилиси, 1957; Ягоо ж. Грузинская миниатюра, М., 1966; Северов Н. П. Памятники грузинского зодчества, М., 1947; Джанберидзе Н. и Кинцурашвили С. Архитектура Советской Грузии, М.— Тбилиси, 1958; Чубинашвили Г. Н. Грузинское чеканное искусство, [т. 1—2], Тбилиси, 1959; Гордезиани Б. Грузинская графика, Тбилиси, 1963; Мхендзе Л. Скульптурный портрет в Грузии, Тбилиси, 1967; Беридзе В. Грузинская архитектура с древнейших времен до начала XX века, Тбилиси, 1967; Гугушвили Э. и Джанелидзе Д. Грузинский государственный драматический театр имени Котэ Марджанишвили, Тбилиси, 1958; Джапелидзе Д. С. Грузинский театр с древнейших времен до второй половины XIX века, Тбилиси, 1959; История советского драматического театра, т. 1—5, М., 1966—69; Февральский А. В. Театр имени Руставели, М., 1959; Грузинская музыкальная культура. Сб. ст., М., 1957; Церетели К. Кинопскусство Советской Грузии, М., 1969; Чхиквадзе Г. Основные типы грузинского народного многоголосья. М., 1964; Торадзе Г. Композиторы Грузии, Тбилиси, 1968.

Г. Р. Гвелесіяні (прырода, насельніцтва, гаспадарка), *Э. В. Хаштарыя* (гістар. нарыс), *Р. З. Чхіквадзе* (музыка), *В. Жгенці* (літаратура). Тбілісі; *І. У. Саламевіч* (бел.-груз. літ. сувязі). Мінск.

ГРУЗІНСКІ Аляксей Яўгенавіч [21.4(3.5). 1858, Масква — 22.1.1930], рускі літаратуразнавец. Скончыў Маскоўскі ун-т (1883). Друкавацца пачаў у 1886. Аўтар нарысаў пра Дз. Фанвізіна, В. Бялінскага, М. Лермантава, І. Тургенева, Дантэ, У. Шэкспіра і інш. Пераклаў араб. казкі, творы Нізамі, Р. Тагора. Адзін з першых даследчыкаў тэкстаў Тургенева і Л. Талстога. Удзельнічаў у падрыхтоўцы юбілейнага поўнага збору твораў Талстога. Вывучаў бел. фальклор і этнаграфію [арт. «З этнаграфічных назіранняў у Рэчыцкім павеце Мінскай губ.», 1891; «Духоўныя вершы (Мінская губ., Рэчыцкі пав.)», 1898; «П. В. Шэйн», 1900].

Тв.: Литературные очерки, М., [1907]; И. С. Тургенев, М., 1918.

Літ.: Словарь членов Об-ва любителей российской словесности, М., [1911]. *І. У. Саламевіч*. Мінск.

ГРУЗІНЫ (саманазва картвелі, іверы), нацыя, асноўнае насельніцтва Грузінскай ССР (66,8% паводле перапісу 1970). У СССР — 3245 тыс. чал. (1970). Жывуць таксама ў Азербайджане, Арменіі. За мяжой больш за 100 тыс. (Турцыя, Іран). Мова грузінская картвельскай групы. Веруючыя Г.— праваслаўныя, часткова мусульмане-суніты. Пісьменнасць узнікла ў 5 ст.

Народнасць фарміравалася ў пач. 1-га тысячагоддзя да н. э. да 6—10 ст. н. э. з плямёнаў, якія жылі ў бас. р. Чарох. Г. склаліся з 3 этн. груп: картаў, мегрэла-чанаў (занаў) і сванаў. Кожная група ўзнікла ад кансалідацыі больш дробных плямёнаў. У 12 ст. насельніцтва Грузіі налічвала каля 5 млн. чал. Пасля крывавых войнаў на працягу 5 ст. з харэзмійцамі, манголамі, полчышчамі Цімура, іранскімі і турэцкімі заваёўнікамі ў краіне ў канцы 18 ст. было 675 тыс. чал. У пач. 19 ст. Грузія далучана да Расіі. У канцы 19 ст. склаўся груз. буржа. нацыя. У залежнасці ад мясцовых асаблівасцей грамадскага развіцця культуры і побыту, дыялектных адрозненняў вызначаюцца этнагр. групы Г.: картлійцы, кахеціцы, тушыны, хеўсуры, пшавы, махеўцы, мціулы, гудамакарцы, інгілойцы, кізікцы, джавахі, імерэціны, рачынцы, лечхумцы, гурыйцы, аджарцы, мегрэлы, лазы (чаны), сваны. Развіццё капіталізму садзейнічала збліжэнню этнагр. груп.

З усталяваннем Сав. улады ў Грузіі Г. сфарміраваліся ў сацыяліст. нацыю. Адрозненні ў матэрыяльнай культуры, побыце і гаспадарцы асобных груп сціраюцца. Нац. адзенне мужчын: чаха з доўгімі і шырокімі рукавамі, якую надзяюць на закрытую кашулю (ахалохі) цёмнага колеру, ці кароткая куртка і шырокі скураны з насечкаю пояс; на нагах мяккія без заднікаў боты. У жанчын: суконка ў талію — картулі, каба з доўгай шырокай спадніцай. Традыцыйнае жыллё: драўляныя будынкі на палях у Зах. Грузіі; дарбазі, саклі ва Усх. Грузіі, будынкі-крэпасці ў горных раёнах. (Пра гісторыю, гаспадарку і культуру Г. гл. ў арт. *Грузінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*.)

ГРУЗІЯ, гл. *Грузінская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*.

ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА Кандрат Іванавіч (21.9.1794, Магілёў — 1874), беларускі ўрач і грамадскі дзеяч. Д-р мед. н. (1823). У 1820 скончыў мед. ф-т Віленскага ун-та. У 1821—28 працаваў у ваен. шпіталі ў Магілёве, дзе напісаў дысертацыю «Наогул пра пахвінныя грыжы і новы спосаб іх лячэння шляхам аперацыі». У 1833—68 (Пецярбург) выдаваў мед. газ. «Друг здравия», якая адыграла пэўную ролю ў развіцці айч. навукі і папулярызацыі мед. ведаў. Аўтар прац па фізіял. і паталогіі дзіцячага арганізма, гігіене, дыэтэтыцы і курарталогіі.

Тв.: Монография о радикальном лечении пахомошоночных гриж..., СПб., 1837; Физиология поэзии и счастья, СПб., 1865.

Літ.: Стельмашонок И. М. Кондратий Иванович Грум-Гржимайло, «Здравоохранение Белоруссии», 1969, № 10.

ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА Рыгор Яфімавіч [5(17).2.1860, Пецярбург — 3.3.1936], савецкі географ-усходазнавец. У 1884—90 даследаваў Цянь-Шань, Памір, Зах. Кітай. У 1903—14 зрабіў шэраг паездак і экспедыцый у Зах. Манголію, Уранхайскі край (Туву), на Д. Усход. Рускае геагр. т-ва прысудзіла яму Вялікі залаты медаль, прэмію імя Пржавальскага (1891), прэмію імя Тыло (1915), Парыжская АН — прэмію імя Чыхачова (1893). Імем Г.-Г. названы 2 ледавікі (на Паміры і Цянь-Шані), перавал Сіхатэ-Аліня. Аўтар многіх навук. прац, у т. л.: «Апісанне падарожжа ў Заходні Кітай» (т. 1—3, 1896—1907), «Заходняя Манголія і Уранхайскі край» (т. 1—3, 1914—30).

Літ.: Грумм-Гржимайло А. Г. Дела и дни Григория Ефимовича Грумм-Гржимайло (путешественника и географа), М., 1947.

ГРУНВАЛЬДСКАЯ БІТВА 1410, бітва паміж аб'яднанымі арміямі Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага, з аднаго боку, і войскамі Тэўтонскага ордэна — з другога. Адбылася ў час *Вялікай вайны 1409—11*. Закончылася поўным разгромам арміі крыжакоў. На нарадзе ў Бярэсці (Брэсце) у снеж. 1409 польскі кароль Уладзіслаў II *Ягайла* і вял. князь Літвы *Вітаўт* распрацавалі дэталёвы план кампаніі 1410. Ордэн у сваю чаргу вербаваў наёмнікаў з усёй Еўропы, заручыўся падтрымкай чэшскага і венгерскага каралёў. У ліп. 1410 аб'яднаныя войскі Польшчы і Вял. кн. Літ. перайшлі граніцу ордэна. Праціўнікі сустрэліся пад вёскай Грунвальд, дзе 15 ліп. адбылася бітва.

Дакладных звестак пра колькасць войск абодвух бакоў няма. Польскі гісторык Ян Длугаш піша толькі пра колькасць харугваў (атрадаў) у кожнай арміі: 90 харугваў у польска-літоўскім войску (з іх 50 выстаўлена Польшчай, 40 — Вял. кн. Літ.), 51 харугва ў крыжакоў. Даследчыкі лічаць, што саюзная армія мела каля 40 тыс. чал., армія крыжакоў — крыху менш, але была лепей узброеная. У арміі Вял. кн. Літ., акрамя літ., рус., укр. атрадаў і тат. конніцы, былі войскі з бел. земляў (харугвы Полацкая, Віцебская, Гарадзенская, Берасцейская, Пінская, Новагародская, Лідская, Ваўкавыская, Мсціслаўская, Драгічын-



ская, Мельніцкая і інш.), а таксама чэшска-мараўскія атрады. Усёй саюзнай арміяй камандаваў Ягайла, войскамі Вял. кн. Літ.— Вітаўт. Армію крыжакоў узначальваў вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген. Бітва пачалася з артыл. дуэлі. Першым атакі супраць левага крыла крыжакоў пачала лёгкая конніца Вял. кн. Літ., якая неўзабаве прыняла на сябе моцныя ўдары ворага. Пасля жорсткоў частка літ. атрадаў адступіла. Іншыя харугвы Вітаўта не спынялі барацьбы, асабліва напружанай на левым флангу арміі Вял. кн. Літ. Тут размяшчаліся тры смаленскія харугвы пад камандаваннем мсціслаўскага князя Сямёна Лінгвена Альгердавіча, якія геаічна вытрымалі націск ворага. Нягледзячы на вял. страты (адзін атрад загінуў поўнасцю), смаленскія атрады выстаялі «і гэтым заслужылі,— паводле Длугаша,— вялікую славу». Яны злучыліся з польскімі харугвамі, якія стрымлівалі і атакоўвалі гал. сілы праціўніка. Польскія харугвы, падтрыманыя войскамі Вітаўта, прарвалі фронт, акружылі ворага і нанеслі новыя ўдары. К вечару бітва закончылася разгромам крыжакоў. Армія ордэна фактычна перастала існаваць. Ордэн страціў больш за 30 тыс. забітымі, параненымі і палоннымі. Былі забіты вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген і інш. знатныя рыцары. Вынікі перамогі ў Г. б. замацаваў Таруньскі мір 1411.

Разгром крыжакоў пад Грунвальдам спыніў агрэсію Тэўтонскага ордэна на ўсход і абумовіў яго хуткі заняпад як самастойнай дзяржавы. Перамога ў Г. б. садзейнічала экан. развіццю Польшчы, Літвы і Беларусі, якія атрымалі магчымасць шырэй удзельнічаць у міжнар. гандлі на Балтыйскім м. На месцы гістарычнай Г. б. ў Альштынскім ваяводстве (ПНР) у 1960 польскім урадам пастаўлены помнік.

Літ.: История Польши, т. 1, 2 изд., М., 1956, с. 122—128; Длугош Ян. Грюнвальдская битва, [пер. з лац.], М.—Л., 1962; Пашуто В. и Ючас М. 550-летие Грюнвальдской битвы, «Военно-исторический журнал», 1960, № 7; Kuczyński S. M. Wielka wojna z zakonem Krzyżackim w latach 1409—1411, 2 wyd., Warszawa, 1960; Jučas M. Žalgirio mušis, 2 leid., Vilnius, 1960.

С. А. Шчарбакоў. Мінск.

ГРУНЕВАЛЬД Матыяс, нямецкі жывапісец, гл. *Нітхарт* М.

ГРУНТ (ням. Grund глеба, аснова), агульная назва горных парод глебаў і штучных утварэнняў, якія выкарыстоўваюцца як прыродная аснова, асяроддзе і матэрыял для інжынерных збудаванняў. Па трываласці падзяляюцца на 3 групы: 1) скальныя — граніт, гнейс, пясчанікі і інш.; 2) паўскальныя — мергель, аргіліт і інш.; 3) рыхлыя — пясок, гліна, суглінак, супесак. Вылучаюць таксама групу слабых грунтоў, якія лёгка дэфармуюцца (іл, лёс, торф і інш.). На тэр. Беларусі асноваў збудаванняў і матэрыялам служаць Г. пераважна ледавіковага (суглінкі, гліны, марэнныя супескі), водналедавіковага, азёрнага, азёрна-ледавіковага (стужкавыя гліны) і алювіяльнага паходжання (пяскі, супескі, суглінкі); у асобных раёнах (Мінск, Магілёў, Орша і інш.) выкарыстоўваюцца лёсападобныя грунты (пылаватыя суглінкі, супескі) або паўскальныя (азёрныя мергелі ў Брэсцкай вобл).

Класіфікацыі рыхлых Г. пабудаваны пераважна на прынцыпе суадносін колькасці часцінак розных памераў. Фіз. і мех. ўласцівасці Г. вывучаюцца лабараторнымі і палявымі метадамі (выпрабаванне на сціскание штампамі, зандзіраванне, геафіз. даследаванні, адпампоўванне вады і інш.). Пры выкарыстанні пясчаных грунтоў асабліва значэнне мае іх шчыльнасць і дзеянне вады; гліністых — сціскальнасць і супраціўленне зрушэнню; паўскальных — іх састаў і стан (шчыльнавадонасць, колькасць карбанатаў у пародзе і інш.). Фіз. ўласцівасці Г. вывучае *грунтазнаўства*; пытанні паводзін Г. пад нагрузкай — механіка грунтоў. Вывучэнне саставу і ўласцівасцей грунтоў — задачы інж.-геал. даследаванняў (гл. *Інжынерная геалогія*).

Літ.: Лукашев К. И. Грунты СССР, Л., 1939; Винокуров Е. Ф. Моренные грунты как основания сооружений, Мн., 1968; Винокуров Ф. П., Тетеркин А. Е. и Питерман М. А. Строительные свойства торфяных грунтов, Мн., 1962; Макарочкин М. Ф., Шарай В. Н. и Ловыгин Н. И. Состав и строительные свойства лёссовидных грунтов БССР, Мн., 1959; гл. таксама літ. пры арт. *Грунтазнаўства*.

У. Р. Лабадзенка. Мінск.

ГРУНТАВЫЯ ВОДЫ, першы ад паверхні зямлі гарызонт *падземных водаў*, які падсцілаецца воданепранікальным слоем. Г. в. безнапорныя або слабанапорныя, у БССР пераважна ў рыхлых чацвярцічных адкладах. Глыб. залягання ад 0 да некалькіх дзесяткаў метраў. Над Г. в. месцамі залягае *верхаводка*. Выкарыстоўваюцца Г. в. для водазабеспячэння, у с. гасп., будаўніцтве і інш.

Вобласць насычэння Г. в. атмасфернымі ападкамі амаль супадае з вобласцю іх пашырэння. У абласцях прамерзлай і нармальнай вільготнасці Г. в. прэсныя, у засушлівых — мінералізаваныя, з асобнымі лінзамі прэсных. У Еўрап. ч. СССР з ПнЗ на ПдУ мінералізацыя водаў павялічваецца ад ультрапрэсных да мінералізаваных. Г. в. цесна звязаны з рэкамі і звычайна насычаюць іх. У раёнах вечнай мерзлаты наз. надмярзлотнымі. Залягаюць блізка ад паверхні, таму лёгка забруджваюцца. Рэжым Г. в. залежыць ад метэаралагічных фактараў і пары года, вызначаецца зменай узроўню, запасаў, дэбіту, хім. саставу. Паверхня Г. в. наз. люстэркам, якое паказваецца на картах *ізабаізагіпсамі*. Г. в. выклікаюць месцамі забалочванне тэрыторый (напр., Прыпяцкая нізіна).

Літ.: Овчинников А. М. Общая гидрогеология, 2 изд., М., 1954; Справочное руководство гидрогеолога, т. 1—2, Л., 1967.

П. А. Кісялёў. Мінск.

ГРУНТАЗНАЎСТВА, раздзел *інжынернай геалогіі*, які вывучае фізіка-механічныя і фізіка-хімічныя ўласцівасці грунтоў, умовы іх утварэння і змены ў працэсе развіцця і ад дзеяння інж.-буд. мерапрыемстваў.

Вывучае розныя па ўзросце, паходжанні і петраграфічным саставе грунты (горныя пароды, глебы, штучныя утварэнні) для забеспячэння рацыянальных метадаў буд-ва, устойлівасці і даўгавечнасці збудаванняў. Цесна звязана з петраграфіяй, гідрагеалогіяй, глебазнаўствам, механікай грунтоў і інш. Падзяляецца на агульнае Г., рэгіянальнае Г. і тэхн. меліярацыю грунтоў. Агульнае Г. вывучае састаў, структуру, тэкстуру, уласцівасці грунтоў, асабліва іх дэфармацыю і трываласць (гл. таксама *Водныя ўласцівасці горных пород*); рэгіянальнае — асноўныя інж.-геал. асабліваці і ваканамернасці прасторавага размеркавання розных грунтоў (найперш у раёнах вялікага буд-ва); тэхн. меліярацыя грунтоў распрацоўвае метады штучнага паляпшэння іх уласцівасцей.

Літ.: Лукашев К. И. Элементы генетического грунтоведения, Л., 1938; Приклонский В. А. Грунтоведение, ч. 1, 3 изд., М., 1955, ч. 2, М., 1952; Саваренский Ф. П. Инженерная геология, 2 изд., М.— Л., 1939; Сергеев Е. М. Грунтоведение, 2 изд., М., 1959.

У. Р. Лабадзенка. Мінск.

ГРУПА (у геалогіі), найбуйнейшая адзінка міжнар. стратыграфічнай шкалы, якая аб'ядноўвае комплекс горных парод, утвораных на працягу геал. эры.

Вылучаюць архейскую, пратэразойскую, палеазойскую, мезазойскую і кайназойскую Г. Кожная з іх адпавядае вялікаму этапу развіцця зямной кары і арган. жыцця, які завяршаўся вялікімі ў гісторыі Зямлі тэктанічнымі рухамі (гораўтварэнне, кантынентальныя падняцці), праяўленнямі вулканізму і перабудовай рэльефу зямной паверхні (зменай формы, памераў і размяшчэння мацерыкоў і мораў). Гл. таксама *Геалагічнае летазлічэнне*.

ГРУПА (у матэматыцы), адно з найбольш важных паняццяў сучаснай матэматыкі, якое ўзнікла пры абагульненні дзеянняў над звычайнымі лікамі. Развіццё навукі і тэхнікі выклікала неабходнасць выконваць пэўныя аперацыі (складанне, множанне) не толькі над лікамі, але і над *вектарамі*, мнастваміі, *матрыцамі*, падстаноўкамі, мех. рухамі і інш. аб'ектамі. Тэорыя Г. шырока выкарыстоўваецца ў розных раздзелах матэматыкі (*алгебра*, *функцыянальны аналіз*, *тапалогія*) і ў фізіцы (напр., у *квантавай механіцы*), пры вывучэнні заканамернасцей сіметрыі.

Непустое мноства G элементаў адвольнай прыроды наз. Г., калі: 1) на мностве G зададзена аперацыя f, якая дае магчымасць па ўсякай упарадкаванай пары a, b розных ці аднолькавых элементаў з G знайсці адзіны элемент a/b, які наз. рэзультатам аперацыі і належыць да G; 2) гэтая аперацыя асацыятыўная, г. зн. для кожных трох неабавязкова розных элементаў a, b, c будзе $(a/b)/c=a/(b/c)$ (дужкі паказваюць парадак выканання аперацыі); 3) у G існуе нейтральны элемент e, для якога $a/e=a$ пры кожным a з G; 4) для кожнага a з G існуе ў G элемент x (адваротны да a), для якога $a/x=e$. Звычайна пішуць ab замест a/b (мультыплікатыўная форма запісу). Тады групавую аперацыю наз. множаннем, нейтральны элемент наз. адзінкай, а адваротны да a элемент абазначаюць праз a^{-1}. У шэрагу выпадкаў ужываецца адытыўная форма запісу $a+b$, пры якой групавую аперацыю наз. складаннем, а нейтральны і адваротны элемент абазначаюць праз 0 і $-a$ і наз. адпаведна нулём і процілеглым элементам. Часам групавую аперацыю наз. кампазіцыяй элементаў і выкарыстоўваюць для яе інш. формы запісу: $a\cdot b$, $a*b$, $a\circ b$ і г. д. У Г., увогуле кажучы, $ab\neq ba$. Калі $ab=ba$ для любых a і b з G, то G наз. камутатыўнай, ці абелевай, Г. Напр., сукупнасць усіх цэлых лікаў (0, ±1, ±2, ...) — камутатыўная Г. адносна складання. Г. наз. канечнай ці бесканечнай у залежнасці ад таго, будзе мноства G канечным ці бесканечным. Частка элементаў Г., якая з'яўляецца Г. адносна той жа аперацыі, наз. падгрупай. Тэорыя Г. пачала афармляцца ў канцы 18 — 1-й пал. 19 ст. ў выглядзе канечных Г. падстановак у сувязі з задачай рашэння алг. ураўн. у радыкалах (Ж. Лагранж, Н. Абель, Э. Галуа). У канцы 19 — пач. 20 ст. пачынаюць вывучацца канечныя Г. з элементамі любой прыроды, а потым і бесканечныя, складваецца агульная ці абстрактная тэорыя Г. Заснавальнік айчыннай школы тэорыі Г. выдатны сав. вучоны О. Ю. *Шміт*. Значны ўклад у развіццё тэорыі Г. зрабілі сав. вучоныя А. А. Кулакоў, А. І. Мальцаў, Л. С. Пантрагін, А. К. Сушкевіч, А. Г. Кураш, С. М. Чэрнікаў і інш. Шырока вядомыя беларускія школы тэорыі Г. У АН БССР і БДУ Дз. А. Супруненка, У. П. Платонаў і інш. (Мінск) даследуюць лінейныя і тапалагічныя Г., С. А. Чуніхін, Л. А. Шамяткоў і інш. (Гомель) вядуць даследаванні па тэорыі канечных Г.

Літ.: Шмидт О. Ю. Абстрактная теория групп, у яго кн.: Избранные труды. Математика, М., 1959; Курош А. Г. Теория групп, 3 изд., М., 1967; Супруненко Д. А. Разрешимые и нильпотентные линейные группы, Мн., 1958; Чунихин С. А. Подгруппы конечных групп, Мн., 1964.

С. А. Чуніхін. Гомель.

ГРУПА «ВЫЗВАЛЕННЕ ПРАЦЫ», першая руская марксісцкая арганізацыя, створаная ў 1883 у Жэневе Г. В. *Пляханавым*. У яе ўваходзілі П. Б. *Аксельрод*, В. І. *Засуліч*, Л. Р. Дэйч, В. М. Ігнатаў. Мела на мэце пашырэнне ідэй навук. сацыялізма, крытыку *народніцтва*, распрацоўку пытанняў грамадскага жыцця Расіі. Члены групы перакладалі на рус. мову творы К. Маркса і Ф. Энгельса і тайна перапраўлялі іх у Расію, выдавалі ўласныя працы з крытыкай народніцтва. За час існавання група выдала больш як 250 кніжак і брашур. Адыграла значную ролю і ў пашырэнні марксізма на Беларусі. У Мінску, Гомелі, Гродне атрымлівалі асн. выданні групы, з ёю меў сувязь бел. паэт А. *Гурыновіч*. Прадстаўніком рабочых арг-цый Мінска і Вільні на міжнар. сацыяліст. кангрэсе ў Лондане (1896) была Засуліч. Група яшчэ не была звязана з масавым рабочым рухам, недаацэньвала сялянства і перабольшвала ролю ліберальнай буржуазіі ў рэвалюцыі. Значэнне групы ў тым, што яна «тэарэтычна заснавала сацыял-дэмакратыю і зрабіла першы крок насустрач рабочаму руху» (Ленін У. І. Тв., т. 20, с. 257). Спыніла існаванне на II з'ездзе РСДРП (1903).

Літ.: Ленін У. І. Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супраць сацыял-дэмакратаў?, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); Ягож. Што рабіць?, Тв., т. 5 (там жа, т. 6); Ягож. З мінулага рабочага друку ў Расіі, Тв., т. 20 (там жа,

т. 25); История Коммунистической партии Советского Союза, т. 1, М., 1964; Плеханов Г. В. Избранные философские произведения, т. 1, М., 1956; Из истории борьбы за распространение марксизма в Белоруссии (1883—1917 гг.), Мн., 1958; Жуйков Г. Группа «Освобождение труда», М., 1962; Группа «Освобождение труда», у кн.: История СССР. Указатель советской литературы за 1917—1952 гг., т. 2, М., 1958. *В. І. Яфрэмава.* Мінск.

«ГРУПА НАРАДАВОЛЬЦАЎ», назва дзвюх пераемна звязаных пецярбургскіх рэвалюц. арганізацый. Першая група засн. ў 1891 М. С. *Альмінскім*, разгромлена ў крас. 1894. Другая створана ў 1894 А. А. Фядулавым, А. Ю. Фейтам, А. А. Яргіным; кіраўнікі — А. С. Бялеўскі (Беларусаў) і К. А. Прэйс.

«Г. н.» вяла прапаганду сярод рабочых, мела друкарню, выдавала брашуры, адозвы, «Летучий листок» (4 нумары). Ідэалогія групы — пераходная ад нарадавольніцкай да с.-д. Уплыў марксізма адбіўся на 3-м і 4-м нумарах «Летучего листка» (аўтар Бялеўскі), апошні нумар (9.12.1895) высока ацаніў У. І. Ленін. «Г. н.» падтрымлівала сувязь з *пецярбургскім «Саюзам барацьбы за вызваленне рабочага класа»*, друкавала яго выданні, у т. л. брашуру У. І. Леніна «Тлумачэнне закону аб штрафах, якія спаганяюцца з рабочых на фабрыках і заводах». 24.6.1896 паліцыя разграміла друкарню і арыштавала амаль усіх членаў групы. Большасць б. членаў «Г. н.» улілася ў партыю эсэраў. М. С. Альмінскі, П. М. *Лепяшынскі*, П. Ф. Кудзелі, Л. М. Кніповіч, М. Л. Мешчаракоў сталі дзеячамі бальшавіцкай партыі.


Літ.: Куделли П. Народовольцы на перепутье, Л., 1925; Меньшиков Л. П. Охрана и революция. К истории тайных политических организаций [в России], существовавших во времена самодержавия, ч. 1, М., 1926. *М. В. Біч.* Мінск.

ГРУПАВА́Я АПРАЦО́ЎКА (у машынабудаванні), спосаб апрацоўкі аб'яднаных у тэхнал. групы дэталяў (розных па памерах, часткова — па канфігурацыі) на адных станках без змены інструментаў, прыстасаванняў.

Ужываецца на асобных аперацыях, а таксама пры поўнай апрацоўцы вырабаў у дробнасерыйнай вытворчасці. Ліквідуе шматлікасць тэхнал. схем апрацоўкі. Дазваляе ўжываць аднатыпнае высокапрадукцыйнае абсталяванне і станкі з праграмным кіраваннем. У БССР укаранёна на Магілёўскім з-дзе «Строммашына» і інш.

Літ.: Митрофанов С. П. Научные основы технологической подготовки группового производства, М.—Л., 1965; Чистосердов П. С. Типизация технологических процессов и групповые методы обработки деталей, Мн., 1964; Иванов Е. К. Организация и технология группового производства, Л., 1963.

ГРУПАВА́Я СКОРАСЦЬ, велічыня, якая характарызуе распаўсюджанне негарманічных (г. зн. несінусаідальных) хваляў.



Калі *дысперсія хваляў* адсутнічае, хваля любой формы і інтэнсіўнасці пераміяшчаецца без дэфармацыі са скорасцю v (рыс. *а*). Паколькі ў агульным выпадку форма хвалі пры распаўсюджанні зменьваецца (рыс. *б*), уводзяцца паняцці скорасці фронту, скорасці энергіі і інш. Калі інтэнсіўнасць хвалі не ўплывае на распаўсюджанне (лінейнае асяроддзе) і хваля квазімонахраматычная (амаль монахраматычная), агінальная група хваляў адносна павольна зменьвае форму і рухаецца з Г. с. u, якая пры наяўнасці дысперсіі адрозніваецца ад *фазавай скорасці* v (рыс. *в*). Пры адсутнасці паглынання ў асяроддзі Г. с. супадае са скорасцю пераносу энергіі.

ГРУПЫ КРЫВІ, нармальныя імуналагічныя асаблівасці крыві, якія перадаюцца па спадчыне і не зменьваюцца ўсё жыццё. Гэтыя асаблівасці даюць магчымасць падзяляць прадстаўнікоў пэўнага віду (чалавека, малпаў і інш.) на групы. Г. к. вызначаюцца наяўнасцю ў эрытрацытах, трамбацытах і інш. клетках і тканках арганізма спецыфічных антыгенаў — аглюцынагенаў (АГ), а ў плазме крыві (ці сываратцы) — антыцелаў (гемаглюцынінаў). АГ не залежыць ад полу, узросту, расы (у людзей). Вядома больш за 60 АГ. Філагенетычна роднасныя АГ групуюцца ў антыгенетычныя сістэмы: АВО, рэзус-сістэма (гл. *Рэзус-фактар*), Кел-сістэма (фактар К) і інш.

Сістэму АВО апісалі ў 1901—07 аўстр. імунолаг К. Ландштэйнер і чэш. ўрач Я. Янскі. У залежнасці ад наяўнасці ў эрытрацытах аглюцынагенаў (гемаглюцынагенаў) А і В яны вылучылі 4 асн. групы крыві ў людзей. Першая група 0 (I) не мае АГ А і В; другая група А (II) мае аглюцынаген А; трэцяя — В (III) — аглюцынаген В; чацвёртая — АВ (IV) — аглюцынаген А і В. У крывяной плазме людзей 0 (I) групы адпаведна ёсць 2 тыпы групавых антыцелаў — гемаглюцынінаў: α і β. У плазме людзей групы А (II) ёсць гемаглюцынін β, групы В (III) — гемаглюцынін α. У людзей IV групы антыцелаў да аглюцынагену няма. Пры ўзаемадзеянні гемаглюцынінаў плазмы з адпаведнымі аглюцынагенамі эрытрацытаў (аглюцынагена А з аглюцынінам α і г. д.) эрытрацыты склейваюцца (гемаглюцынуюць) і разбураюцца: кроў несумяшчальная. На рэакцыі гемаглюцынацыі заснавана вызначэнне групы крыві ў людзей. Гэта выкарыстоўваецца пры *пералівanні крыві*, перасадцы тканак і органаў, у судова-мед. экспертызе.

Літ.: Косяков П. Н. Иммунология изоантигенов и изоантител, М., 1965; Доссе Ж. Иммуногематология, пер. с франц., М., 1959.

Я. П. Іваноў. Мінск.

ГРУЦА Аляксей Пятровіч (н. 9.5.1924, в. Пішчыкі Горацкага пав.), беларускі савецкі моваznавец. Д-р філал. н. (1969). З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1951). Настаўнічаў (1951—57). Працаваў у Ін-це моваznаўства АН БССР (1957—69). З 1969 у Мінскім пед. ін-це. Даследуе гісторыю бел. мовы і дыялекталогію. Сааўтар прац: «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963), «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968—69).

Літ.: Развіццё складаназалежнага сказа ў беларускай мове, Мн., 1970.

ГРУША (Pyrus), род пладовых дрэў, сям. ружакветных.


Лісце яйцападобнае, выцягнутае, вострazубчастае або цэласнакрайняе, скурастае, шчыльнае, бліскучае; кветкі белыя або ружаватыя ў шчытках; плады мясістыя, з камяністымі клеткамі. Старажытная расліна. Вядома да 60 відаў, у СССР каля 40 дзікарослых, пашыраных на Каўказе, у Сярэдняй Азіі, Еўрап. частцы і на Д. Усходзе. Культ. сарты паходзяць ад Г. звычайнай (P. communis), Г. лахалістай (P. elaeagrifolia), Г. усурыйскай (P. ussuriensis), Г. кітайскай (P. serotina), Г. снежнай (P. nivalis) і інш. Пладаносіць пачынае на 6—8-ы год, у 20 дрэва дае 150—300 *кг* пладоў. Плады маюць 6—15% цукру, да 0,6% арган. к-т, вітаміны В, С, А; спажываюць свежыя, сушаныя, кансерваваныя, перапрацоўваюць на кампоты, цукаты, віно, мармелад і інш. Размнажаецца Г. прышчэпкамі. На прышчэпы выкарыстоўваюць сеянцы лясной Г. Добра расце на сярэдне- і лёгкасуглінкавых, добра дрэнаваных глебах. Г. мяне зімастойкая і больш цеплалюбная за яблыню.

У БССР найб. пашырана на ПдЗ. Раянаваныя сарты: летнія — *Лімонаўка*, *Безнасенка*, Дзюшэс летні, Беларуска, *Любіміца Клапа*, Бэра раняя; асенне-зімовыя — *Аляксандраўка*, Бэра лошыцкая, Бэра слуцкая, Масляністая лошыцкая.



Груша. 1. Бэра лошыцкая. 2. Аляксандраўка. 3. Бэра слуцкая. 4. Масляністая лошыцкая.





Дываны.
1. В. М. Сенькіна. Дыван «Слуцкі». Воўна. 1960. Віцебскі дывановы камбінат.
2. Гродзенскі дыван. Фрагмент. Воўна. 1969. Майстар Т. І. Караленка з в. Даўкшаны Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл.
3. І. С. Шурупаў. Дыван «Свята». Воўна. 1969. Віцебскі дывановы камбінат.



ка, Масляністая лошыцкая, Бэра лошыцкая, Бэра слуцкая, Марыяна. Пашыраны таксама сарты *Сапяжанка, Цукроўка, Вінёўка, Ільінка*, Гнілуха. Культывуюцца зах.-еўрап. сарты з высакаякаснымі, але менш зімастойкімі пладамі — Масляністая ліфляндская, Добрая Луіза, Лясная Красуня, *Панна*. Сарты самабясплодныя. Найб. шкодзіць Г. парша (псуе плады і лісце). Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Груша, М., 1960; Сюбаров А. Е. и др. Районированные и перспективные сорта плодовых и ягодных культур Белорусской ССР, Мн., 1960.

В. Н. Балобін. Самахвалавічы, Мінскі р-н.

ГРУШАВА, вёска ў Гарадзецкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 29 *км* на У ад Кобрына, 78 *км* ад Брэста, 8 *км* ад чыг. ст. Гарадзец. 945 ж., двароў 289 (1971). Рамонтна-экскаватарныя майстэрні. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГРУШАНКА (Pyrola), род шматгадовых травяністых раслін сям. грушанкавых. Вядома 20 відаў, пашыраных ва ўмераных шыротах Паўн. паўшар'я. У СССР 7 відаў, пераважна ў лясной зоне. На Беларусі 4.



Грушанка круглалістая: *1* — лісце, *2* — кветкі.

Сцябло з доўгім галінастым карэнішчам. Лісце цэласнае або зубчастае, скурастае, размешчана ў ніжняй частцы сцябла. Кветкі ў гронках. Плод — каробачка. Найб. пашыраныя на Беларусі: Г. малая (P. minor), Г. круглалістая (P. rotundifolia, нар. назвы: барлінка, бятопіка лесавая, бацвінка, палявы перац, румянка), Г. зеленаватая (P. virescens, нар. назва станаўнік бабскі). Некат. віды вырошчваюць як дэкаратыўныя. Г. круглалістая — лекавая расліна, мае многа тапідаў.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ГРУШАЎКА, вёска ў Галоўчыцкім с/с Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл., на р. Славечна. Цэнтр калгаса імя Фрунзе. За 20 *км* на ПдЗ ад Нароўлі, 198 *км* ад Гомеля, 35 *км* ад чыг. ст. Ельск. 675 ж., двароў 181 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 вёску спалілі фаш. захопнікі.

ГРУШЫН Пётр Дзмітрыевіч [н. 28.1(10.2). 1906, г. Вольск Саратаўскай губ.], савецкі вучоны ў галіне авіяц. тэхнікі. Акад. АН СССР (1966; чл.-кар. 1962). Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1931. Пасля заканчэння Маскоўскага авіяц. ін-та (МАІ, 1932) на кіруючай інж.-тэхн. рабоце. У 1948—51 дэкан ф-та МАІ. Асн. працы па стварэнні лятальных



апаратаў. На XXIII з'ездзе КПСС выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—6-га скл. Ленінская прэмія 1963. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, медалямі.

ГРУШЭЎСКІ Аляксандр Сяргеевіч (1877, Уладзікаўказ — г. с. невяд.), украінскі бурж. гісторык. Брат М. С. *Грушэўскага*. Найб. значныя навук. працы Г. прысвечаны гісторыі Беларусі эпохі феадалізму: «Гарады Вялікага княства Літоўскага ў XIV—XVI ст.» (1918), «Нарыс гісторыі Турава-Пінскага княства X—XIII ст.» (1901), «Пінскае Палессе» (1901—03), «Павіннасць гарадавой працы ў Вялікім княстве Літоўскім» (1914). У працах Г. сабраны і сістэматызаваны вял. фактычны матэрыял.

М. Ф. Спірыдонаў. Мінск.

ГРУШЭЎСКІ Міхаіл Сяргеевіч [17(29).9. 1866, г. Холм — 25.11.1934], украінскі бурж. гісторык, ідэолаг укр. бурж. нацыяналізму. Адзін са стваральнікаў і кіраўнікоў бурж. арг-цыі — Нац.-дэмакратычнай партыі ў Галіцыі (1899), Т-ва ўкр. паступоўцаў (1908), контррэвалюц. Цэнтр. рады (1917—18). З 1919 у эміграцыі. У 1924 з дазволу ЦВК Украіны Г. вярнуўся ў Сав. Украіну для навук. работы. З канца 1923 акад. АН УССР, в 1929 акад. АН СССР. Аўтар «Гісторыі Украіны — Русі» (т. 1—10, 1898—1936), «Нарысаў гісторыі ўкр. народа» (1904), «Гісторыі ўкр. л-ры» (т. 1—5, 1923—27). Г. сабраў і сістэматызаваў шмат новых крыніц. Аднак тэндэнцыйнасць у адборы і абагульненні фактаў, нацыяналіст. інтэрпрэтацыя абмяжоўваюць навук. значэнне яго прац. Скажаў гісторыю ўкр. народа, паказваў яго бяскласавай, безбурж. сялянскай нацыяй, Кіеўскую Русь лічыў толькі ўкр. дзяржавай. У параўнальным плане вывучаў гісторыю Беларусі, бел.-літоўскія летапісы, юрыд. і літ. помнікі бел. народа; адзначаў ролю бел. земляў і бел. народа ў стварэнні Вял. кн. Літ., звярнуў увагу на цягу бел. зямель да Маскоўскага вял. княства. Неправамерна лічыў украінскімі Берасцейскую зямлю і Турава-Пінскае Палессе, некат. бел. літ. летапісы, а таксама тв. Ф. Скарыны.

Літ.: Историография истории СССР (С древнейших времен до Великой Октябрьской социалистической революции), М., 1961; История Украинской ССР, т. 1—2, Киев, 1969; Рубач М. Реакційна суть націоналістичних «теорій» безкласовості та «єдиного потоку», Київ, 1955; Юбілейний збірник на пошану акад. М. С. Грушевського..., т. 3, Київ, 1929.

С. А. Шчарбакоў. Мінск.

ГРУШЭЦКІ Антон Антонавіч (псеўд. А. Дамброўскі; 1734, Валынь — 1798), жывапісец. Прадстаўнік позняга барока. Жывапісу вучыўся ў Камянец-Падольску і Львове. Манах. У 1760 парваў з базыльянскім ордэнам і пераехаў у Кракаў, дзе атрымаў правы цэхавага майстра. У гэты перыяд стварыў партрэт рэктара Кракаўскага ун-та К. Ярмундовіча, карціны «Самсон і Даліла», «Лот з дочкамі», аформіў алтар бернардзінскага касцёла ў Альверніі. У 1770 пераехаў у Супрасль, потым у Гродна, дзе ўдзельнічаў у стварэнні (каля 1774) дэкар. кампазіцыі для інтэр'ераў палаца Тызенгаўза на Гарадніцы і бернардзінскага манастыра (1788, з Ф. Міхалкевічам). Сярод работ 70-х г.: «Св. Еранім», «Але-

горыя вернасці», «Мужнасць св. Варфаламея», «Рознаколерныя львы» і інш.

Я. Н. Мараш. Гродна.

ГРЫБ Кузьма Пятровіч (1911, в. Сінск Рэчыцкага пав. Мінскай губ.— 29.9.1943), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. У Чырв. Арміі з чэрв. 1941, на фронце з чэрв. 1943. Гвардыі малодшы л-т, камандзір стралковага ўзвода, удзельнік баёў на Зах. і Паўд.-Зах. франтах. Вызначыўся ў вер. 1943 каля в. Куцавалаўкі Ануфрыеўскага р-на Кіраваградскай вобл. Адзін з першых фарсіраваў Дняпро. У баі за плацдарм ранены Г. гераічна адбіваў контратакі ворага, пакуль не загінуў.

ГРЫБАЕДАЎ Аляксандр Сяргеевіч [4(15).1.1795 (паводле інш. крыніц 1794), Масква — 30.1(11.2).1829], рускі пісьменнік і дыпламат. З дваран. Скончыў славеснае і юрыд. аддзяленні філас. ф-та (1810), вучыўся на фіз.-матэм. ф-це Маскоўскага ун-та. У 1812 пайшоў добраахвотнікам у армію. Служыў у Казані, Кобрыне (1813) і Брэсце (1813—16). На Беларусі блізка пазнаёміўся з нар. побытам, цікавіўся вусна-паэт. творчасцю бел. народа. Першыя творы — «Пісьмо з Брэст-Літоўска да выдаўца [«Вестника Европы»]» (1814), арт. «Пра кавалерыйскія рэзервы» (1814), камедыя «Маладыя муж і жонка» (1815, вольная пераробка камедыі франц. драматурга Крэзэ дэ Лесэра «Сямейная тайна»). З 1816 жыў у Пецярбурзе, там зблізіўся з А. Пушкіным, В. Кюхельбекерам, П. Каценіным. З 1818 сакратар рус. місіі ў Персіі, з 1822 у штабе ген. А. П. Ярмолава ў Тыфлісе. Быў арыштаваны (1826) за сувязь з дзекабрыстамі (К. Рылеевым, А. Бястужавым, А. Адоеўскім і інш.), вызвалены з-за нястачы доказаў. З 1826 на дыпламат. і дзярж. службе на Каўказе. У 1828 паўнамоцны пасланнік у Персіі. Забіты ў Тэгеране ў выніку змовы перс. і англ. рэакц. колаў, якія баяліся ўмацавання пазіцый Расіі ў Персіі. Пахаваны ў Тыфлісе. Аўтар камедый «Студэнт» (нап. 1817, з Каценіным), «Прытворная нявернасць» (1818, з А. Жандрам), «Свая сям'я, ці Замужняя нявеста» (1818, з А. Шахаўскім і М. Хмяльніцкім), оперы-вадэвіля «Хто брат, хто сястра, або Падман за падманам» (нап. 1823, з П. Вяземскім, муз. А. Вярстоўскага). Зберагліся накіды і планы драмы Г. пра Айч. вайну 1812, дзе ён збіраўся паказаць трагічны лёс апалчэнца-партызана з прыгонных. Сусв. вядомасць прынесла Г. рэаліст. камедыя ў вершах «Гора ад розуму» (закончана ў 1824; урыўкі надрук. ў альманаху «Русская талия» за 1825; 1-е выд. з вялікімі цэнзурнымі скажэннямі 1833). Забароненая да друку царскай цэнзурай камедыя распаўсюджвалася ў рукапісах (налічваюць каля 40 тыс. экз.). Дзекабрысты



выкарыстоўвалі яе для паліт. агітацыі. У Гомельскім краязнаўчым музеі зберагаецца унікальны спіс «Гора ад розуму» з новымі абзацамі і словамі на рус. і франц. мовах, дапісанымі рукой Г. Гэты варыянт камедыі належаў графу І. Ф. Паскевічу. У аснове твора тыповы на той час грамадска-паліт. канфлікт — сутыкненне свабадалюбнага героя, посьбіта дзекабрысцкіх ідэй, з рэакцыянерамі-прыгоннікамі. Сатыр. вобразы Фамусава, Скалазуба, Малчаліна, якія сталі назоўнымі імёнамі, увасабляюць найб. характэрныя рысы прыгонніцкага ладу і бюракратычнай сістэмы рус. самадзяржаўя. Мова камедыі глыбока народная, багатая на афарызмы; многія трапныя выразы сталі нар. прыказкамі. Маст. вартасць і грамадскае значэнне твора грунтоўна раскрылі А. Пушкін, В. Бялінскі, А. Герцэн, М. Чарнышэўскі, М. Дабралюбаў, І. Ганчароў, М. Горкі, А. Луначарскі. Сатыр. вобразамі і асобнымі выразамі камедыі шырока карыстаўся У. І. Ленін для выкрыцця сучасных яму паліт. асоб і з'яў. Творчасць Г. адыграла вялікую ролю ў станаўленні і развіцці рэалізму ў рус. і сусв. л-ры і тэатр. мастацтве.

Тв.: Соч., М.—Л., 1959; Соч. в стихах, 2 изд., Л., 1967; бел. пер.— Гора ад розуму, Мн., 1949.

Літ.: Литературное наследство, [т.] 47/48 — А. С. Грибоедов, М., 1946; тое ж, т. 60, кн. 1, М., 1956; Орлов В. Н. Грибоедов, Л., 1967; А. С. Грибоедов в русской критике. Сб. ст., М., 1958; Нечкина М. В., А. С. Грибоедов и декабристы, 2 изд., М., 1951; Попова О. П. Грибоедов-дипломат, М., 1964; Красоўскі М. Грыбаедаў у Брэсце (1813—1816 гг.), «Полымя», 1947, № 4.

ГРЫБАНЫ, вёска ў Мастоцкім с/с Магілёўскага р-на. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 20 *км* на ПнУ ад Магілёва, 16 *км* ад чыг. ст. Лупалава. 336 ж., гасп. 104 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГРЫБАЎ Сяргей Яфімавіч [5(17).7.1895, г. Рослаўль — 29.7.1938], савецкі ваенны дзеяч, герой грамадз. вайны, камкор (1935). З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1926. З 1914 у арміі. Пасля Лют. рэв. 1917 чл. палкавога к-та. З 1918 у Чырв. Арміі на Зах. фронце, камандзір палка, брыгады. За гераізм пры вызваленні Беларусі ад польскіх інтэрвентаў узнаг. 3 ордэнамі Чырв. Сцяга. З ліст. 1928 камандзір 5-га стралк. корпуса, які размяшчаўся ў БССР. З 1935 нам. камандуючага, з 1937 камандуючы войск Паўн.-Каўказскай ваен. акругі. Чл. Ваен. савета пры НКА СССР. На XIII з'ездзе КП(б)Б выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XIV, XV — чл. ЦК. Чл. ЦВК БССР (1929—35) і ЦВК СССР.



ГРЫБАЎЦЫ, вёска ў Рэплеўскім с/с Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Барацьбіт». За 34 *км* на ПнЗ ад Ваўкавыска, 81 *км* ад Гродна, 22 *км* ад чыг.

Грыбы I (ядомыя). 1. Баравік яловы. 2. Падасінавік жоўта-буры. 3. Падбярозавік звычайны. 4. Махавік жоўта-буры. 5. Масляк позні. 6. Страчок звычайны. 7. Ваўнянка. 8. Смаржок звычайны. 9. Апенька восеньская. 10. Сыраежка зялёная.

Грыбы II (ядомыя).
1. Шампіньён звычайны.
2. Грузд сапраўдны.
3. Рыжык хваёвы.
4. Таўстуха.
5. Лісічка звычайная.
6. Свінуха тоўстая.
7. Валуй.
8. Бялянка.

Грыбы, ядомыя на ранніх фазах развіцця:
9. Рагацік жоўты.
10. Порхаўка шыпаватая.
11. Пеўнік стракаты.

Грыбы III (ядавітыя).
1. Бледная паганка.
2. Гіграфор канічны.
3. Мухамор чырвоны.
4. Мухамор парфіравы.
5. Мухамор паганкападобны.
6. Мухамор шэры.
7. Гаварушка пабеленая.
8. Апенька несапраўдная цагельна-чырвоная.
9. Міцэна чыстая.
10. Апенька несапраўдная серна-жоўтая.



Грызуны. 1. Нутрыя. 2. Дзікабраз. 3. Бабёр. 4. Крапчаты суслік. 5. Вавёрка звычайная ўлетку (злева) і зімою. 6. Палятуха. 7. Вялікі тушканчык. 8. Мышоўка лясная. 9. Мыш-малышка. 10. Чорны пацук. 11. Грабеньчуковая пясчанка. 12. Хамяк звычайны. 13. Андатра. 14. Джунгарскі хамячок. 15. Вадзяны пацук. 16. Палёўка звычайная. 17. Рыжая (лясная) палёўка. 18. Нарвежскі лемінг. 19. Сляпыш малы.

ст. Рось. 135 ж., гасп. 46 (1971). 2 пач. школы, б-ка, магазін.

ГРЫБАЧО́Ў Мікалай Мацвеевіч [н. 6(19).12. 1910, в. Лопуш Бранскага пав. Арлоўскай губ.], рускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1943. З сялян. З 1950 гал. рэдактар часопіса «Советский Союз». Друкавацца пачаў у 1926. Першы аб. вершаў «Паўночны Захад» (1935). Найлепшыя паэмы «Калгас «Бальшавік» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948) і «Вясна ў «Перамозе» (1948, Дзярж. прэмія СССР 1949) — пра жыццё паслявае. вёскі. Лірыка Г. філас.-публіцыст. характару. Пераклаў раман П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі». На XXII—XXIV з'ездах КПСС выбраны канд. у чл. ЦК. З 1950 сакратар праўлення СП СССР. Ленінская прэмія 1960. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., 4 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Избр. произв., т. 1—3, М., 1960; Полемика. Статьи и заметки о л-ре, М., 1963; Сталь и моль, М., 1963; Белое — черное, М., 1965; Белый ангел в поле, М., 1968; И ветер с четырех сторон..., М., 1968; Выбор века, М., 1969; Исповеди в пути, М., 1970; бел. пер.— у кн.: Рускай савецкай паэзіі, Мн., 1953.

Літ.: Ильин В. Николай Грибачев. Гнев и нежность, М., 1968; Привалов Б. А. Николай Грибачев. М., 1962.

ГРЫБІНА, вёска ў Круглянскім р-не Магілёўскай вобл. Падпарадкоўваецца Круглянскаму пасяльковаму Савету. Цэнтр калгаса «Свабода». За 6 *км* на ПнЗ ад г. п. Круглае, 68 *км* ад Магілёва, 18 *км* ад чыг. ст. Талачын. 82 ж., двароў 27 (1971). Вет. пункт.

ГРЫБКОВЫЯ ХВАРОБЫ ЖЫВЕЛ, гл. *Мікозы.*

ГРЫБКОВЫЯ ХВАРОБЫ СКУРЫ (дэрматамікозы), хваробы скуры, выкліканыя патагеннымі грыбкамі. Крыніца інфекцыі — хворыя людзі, цяляты, каты, пацукі. Падзяляюцца на 4 групы: кератамікозы, эпідэрмамікозы, трыхамікозы і глыбокія сістэмныя мікозы.

Кератаміказы: *вотруб'епадобны лішай*, эрытразма, трыхамікоз. Узбуджальнікі іх паразітуюць у паверхневым слоі скуры, запалення ля не выклікаюць. Мала заразныя. Пры эпідэрмамікозах (эпідэрмафітыя і рубрафітыя ступняў, пахвінная эпідэрмафітыя) пашкоджваюцца скура і пазногці, а пры *кандыдамікозах*, апроч таго, слізістыя абалонкі. Трыхамікозы (трыхафітыя, мікраспарыя, фавус) выклікаюць хваробы скуры, валасоў і пазногцяў (рэдка). Значна радзей бываюць глыбокія сістэмныя мікозы, якія пашкоджваюць глыбокія слаі скуры, розныя органы і сістэмы арганізма (актынамікоз, бластамікоз, хромамікоз, споратрыхоз, какцыдыядоз, гістаплазмоз і інш.).


Лячэнне: антыбіётыкі (ністацін, леварын, грызеафульвін) назначаюць унутр, амфатэрыцын В — у вену; растворы ёду і анілінавых фарбаў, нітрафунгіну і інш.; мазі сернасаліцылавая, сернадзягцярная, вундэцынавая, дэкамінавая, ністацінавая і інш. (вонкава). Прафілактыка: ізаляцыя хворых, праверка асоб, якія мелі кантакт з хворым, дэзінфекцыя яго рэчаў, вет. нагляд за жывёлай.

Літ.: Ариевич А. М. и Степанищева З. Г. Атлас грибковых заболеваний кожи, М., 1951; Кашкин П. Н. Медицинская микология, Л., 1962; Многотомное руководство по дерматовенерологии, т. 2, Л., 1961. *Л. І. Багдановіч.* Віцебск.

ГРЫБКО́Ў Мікалай Іванавіч [н. 14(27).5. 1908, г. Елацьма Тамбоўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1939. Зімой 1943/44 удзельнічаў у баях пад Віцебскам і Оршай. Вызначыўся 23—24.6.1944 у час наступлення на тэр. Магілёўскай вобл. Лейтэнант Г. узначаліў батальён, які трапіў у акружэнне, арганізаваў кругавую абарону; за 14 гадзін батальён адбіў 6 контратак праціўніка. Рота Г. з сапёрамі за 2 гадзіны наладзіла пераправу цераз Дняпро на Пн ад Магілёва. Жыве ў Чаплыгіне Ліпецкай вобл.

ГРЫБНА, возера ў бас. р. Дражбіткі, левага прытока Сосніцы (бас. Зах. Дзвіны), у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,78 *км²*. Даўж. 2 *км*, найб. шыр. 1 *км*, сярэдняя 0,3 *км*. Вадазбор (43,1 *км²*) паката-хвалісты. Воз. праточнае, злучана пратокамі з азёрамі Клетнае, Званае, Арлея. Водзяцца плотка, шчупак, акунь, язь, лінь, гусцяра.

ГРЫБНІЦА, міцэлій (грэч. *mýkēs* грыб), вегетатыўнае цела *грыбоў*. У большасці відаў складаецца з тонкіх разгалінаваных ніткападобных утварэнняў — гіфаў, якія растуць канцамі і пашыраюцца ў субстраце ці на яго паверхні. У Г. ніжэйшых грыбоў няма папярочных перагародак, у вышэйшых — перагародкі дзеляць гіфы на клеткі. Праз міцэлій грыбы ўсмоктваюць ваду і растворыя ў ёй пажыўныя рэчывы.



Грыбніца галоўчатай плесні.

Разнавіднасць Г.— рызаморфы і склероцыі. Рызаморфы — шнурападобныя ўтварэнні з гіфаў, звонку ўкрытыя ахоўнай абалонкай; у пошуках пажыўнага субстрату пераносяць грыб у інш. месца. Склероцыі — круглыя ўтварэнні. Маюць у запасе пажыўныя рэчывы; зберагаюць грыб пры неспрыяльных умовах.

Літ.: Кудряшева З. Н. Микология с основами фитопатологии. Мн., 1968.

ГРЫБНЫЯ ХВАРОБЫ РАСЛІН (мікафітозы), хваробы, якія выклікаюцца паразітнымі і паўпаразітнымі *грыбамі*. Прычыняюць страты ўраджаю с.-г. культур у полі і пры хаванні. Перадаюцца спорамі грыбоў, якія ўтвараюцца ў вялікай колькасці, а ў спрыяльных умовах выклікаюць масавыя захворванні раслін — *эпіфітоцыі*.

Споры пераносяцца з насеннем і пасадачным матэрыялам, ветрам і дажджом, насякомымі і інш. На Беларусі бываюць: на збожжавых — *галаўня*, іржа (гл. *Іржа раслін*), *снежная плесня*, карапёвая гніль (гл. *Гніль*), *спарыння*; на бульбе — *фітафтароз*, *макраспарыёз*, рак (гл. *Рак раслін*), *рызактаніёз*, *парша раслін*, *церказпароз*, сухая гніль клубняў; на лёне — *фузарыёз*, *антракноз*, поліспароз, аскахітоз, іржа; на цукр. бураках — церказпароз, перонаспароз, іржа, *фамоз*; на садова-ягадных культурах — пладовая гніль, парша, чорны і звычайны рак, філастыкта, кокамікоз, *кішэнькі слівы*, шэрая гніль костачкавых і інш. Меры барацьбы — агратэхнічныя, хімічныя і біялагічныя.

Літ.: Горленко М. В. Сельскохозяйственная фитопатология, М., 1968; Болезни сельскохозяйственных культур БССР, Мн., 1958; Дорожкин Н. А. Болезни картофеля, Мн., 1955.

М. А. Дарожкін. Самахвалавічы, Мінскі р-н.

ГРЫБЫ (Fungi, Mycetes), ніжэйшыя бесхларафільныя расліны. Вывучаюцца *мікалогіяй*. У быце да Г. звычайна адносяць толькі пладовыя целы шапкавых грыбоў. Але большасць Г. мае выгляд налётаў (мучністых, ватападобных, павуціністых), плям, кропак,

падушачак, некат. з іх можна разгледзець толькі пад мікраскопам. Усяго Г. вядома каля 120 тыс. відаў. Г. пераважна — сапрафіты, некат.— паразіты раслін, радзей чалавека і жывёл. Многія могуць жыць паразітна і сапрафітна (большасць губавых, шмат сумчатых і інш.). Некат. Г.— сімбіёнты ніжэйшых і вышэйшых раслін: з водарасцямі ўтвараюць *лішайнікі*, з многімі вышэйшымі раслінамі — *мікарызу*. Вегетатыўнае цела Г.— *грыбніца*, або міцэлій, развіваецца са споры. Клетка Г. складаецца з пекцінавай, цэлюлознай або хіціпавай абалонкі, цытаплазмы, 1—2 і больш ядраў. Запасныя пажыўныя рэчывы — глікаген і тлушчы. Размнажаюцца Г. вегетатыўна (часткамі грыбніцы, пачкаваннем і інш.) і спорамі, якія ўтвараюцца бясполым і палавым спосабамі. Найб. пашыраны спосаб размнажэння — бясполае ўтварэнне спораў эндагенных (спарангіяспораў і зааспораў) і экзагенных (канідыяспораў).

Паводле асаблівасцей будовы вегетатыўнага цела і спосабаў размнажэння Г. падзяляюцца на ніжэйшыя і вышэйшыя. Спарангіяспоры і зааспоры ўласцівыя ніжэйшым Г.; канідыяспоры — пераважна вышэйшым Г., але трапляюцца і ў ніжэйшых. Полавае ўтварэнне спораў разнастайнае. У ніжэйшых Г. вядомы ўсе тыпы полавага працэсу: ізагамія, гетэрагамія, аагамія, зігагамія. Вынік апладнення — зігота — адразу ператвараецца ў спору (ааспору) і пасля пэўнага перыяду спакою прарастае. У вышэйшых Г. зігота ўтварае споры толькі ў канцы развіцця. Полавым спосабам у вышэйшых Г. утвараецца 2 віды спораў: эндагенныя (аскаспоры) і экзагенныя (базідыяспоры). У большасці Г. у цыкле развіцця адбываецца чаргаванне бясполага і полавага ўтварэння спораў. Разносяцца яны ветрам, насякомымі.

Г. належыць важная функцыя ў кругазвароце рэчываў у прыродзе, разам з бактэрыямі яны разбураюць і мінералізуюць арган. рэчывы, пераважна рэшткі адмерлых раслін, і гэтым удзельнічаюць у глебаўтваральных працэсах. У глебе Г. вялікая колькасць, асабліва мікраскапічных. На 1 *г* глебы прыпадае ад некалькіх соцень да 3 млн. спораў і клетак міцэлію Г.; у глыбіню яны пранікаюць да 40 *см*. Многія Г. выкарыстоўваюцца чалавекам: *дрожджы* (выклікаюць спіртавое браджэнне), пеніцылы (гл. *Плесневыя грыбы*) ідуць на выраб антыбіётыкаў, аспергіл (выкарыстоўваецца для атрымання лімоннай кіслаты), некат. ўжываюцца ў медыцыне (спарыння). *Драпежныя грыбы* выкарыстоўваюцца для барацьбы з небяспечнымі чалавеку нематодамі, якія выклікаюць цяжкую хваробу — анкіластаматоз, і для барацьбы з глебавымі нематодамі — шкоднікамі раслін. Шмат Г. спажываецца (свежыя, сушаныя, соленыя, марынаваныя). У лясах Беларусі расце больш за 70 відаў ядомых грыбоў, з якіх найб. вядомыя (гл. іл. на ўкл.): *баравік, падбярозавік, падасінавік, масляк, рыжык, валуй, ваўнянка, бялянка, грузды, апенькі, лісічкі, махавік, пеўнік, свінуха, сыраежка, шампіньён*, а таксама *гаркуха, гаварушка, зялёнка, падгруздак, паддубавік, польскі грыб, сіняк, смаржковыя грыбы, трюфелі, часночны грыб* і інш. Яны багатыя на бялкі, тлушчы, вугляводы, мінер. рэчывы, вітаміны. У грыбныя гады вял. колькасць першагатунковых сушаных баравікоў экспартуецца. Сярод шапкавых Г. больш за 10 відаў ядавітых. Найб. вядомыя і пашыраныя (гл. іл. на ўкл.): *мухаморы* (паганкападобны, шэры, чырвоны, парфіравы, белы, або *бледная паганка*), шэраг гаварушак, гіграфор канічны, міцэна чыстая, несапраўдныя апенькі. У пладовых целах мухаматаў ёсць атрутныя рэчывы мускарын і мікаатрапін, у бледнай паганцы—аманіцін і фалаідзін (яны не маюць нікага смаку і паху, не разбураюцца пры кіпячэнні, сушцы, засолцы). Вельмі цяжкае атручэнне ад бледнай паганкі, мухаматаў паганкападобнага і смярдзючага. Моцныя страўнікава-кішачныя расстройствы выклікаюць несапраўдныя апенькі — серна-жоўтая і цагляна-чырвоная (адрозніваюцца ад сапраўдных ярчэйшым колерам шапак і зялёным або фіялетава-бурым адценнем пласцінак), гаварушка пабеленая (нагадвае бляклыя сыраежкі), жоўта-чырвоны гіграфор канічны, а таксама невялікі грыбок міцэна чыстая. Да ядавітых належаць многія Г. з ружовымі пласцінкамі, падобныя да шампіньёнаў або бляклых сыраежак; ад шампіньёнаў ружовапласціннікі адрозніваюцца тым, што не маюць кольца на ножцы, а ад сыраежак ружовым колерам пласцінак. Ёсць сярод ядавітых грыбоў і ўмоўна ядомыя: веснавыя страчкі, многія млечнікі. Атрутныя і раздражняльныя рэчывы з іх (гельвелавую к-ту, едкі млечны сок) можна выдаліць кіпячэннем у вадзе 10—15 *мін*. Прыгатаваныя без гэтай перасцярогі страчкі атрутныя (гельвелавая к-та выклікае павелічэнне печані, жаўтуху, развіццё анеміі і інш.). Атруціцца можна і мала праварanымі ці малапрасоленымі свінушкамі, сыраежкамі або старымі перастаялымі грыбамі, у пладовых целах якіх паявіліся атрутныя прадукты распаду (гл. *Атручэнне*). З ядавітых бясшапкавых грыбоў асобна выдзяляецца *спарыння*, якая развіваецца на жыце. Яе склероцыі («ражкі») маюць атрутныя азоцістыя асновы і пры вялікай дозе (у муцэ) выклікаюць цяжкае атручэнне, т. зв. злосныя курчы. Таксама атрутны грыб фузарыум (Fusarium graminearum). Хлеб са збожжа, пашкоджанага ім, выклікае стан, падобны наап'яненне («п'яны хлеб»). Грыб Fusarium sporotrichoideus, які развіваецца на перазімавалым пад снегам зерні проса, жыта, пшаніцы, грэчкі, ячменю, выклікае цяжкую хваробу — аліментарна-таксічную алейкію. Сельская гаспадарка церпіць значныя страты ад паразітных і некат. сапрафітных грыбоў, якія выклікаюць хваробы: рак бульбы, кілу каранёў капусты, чорную ножку капусты, ведзьміны мётлы, *кучаравасць лісця, кішэнькі слівы, мучністую расу, снежную плесню, антракноз, фузарыёз* і інш. (гл. *Грыбныя хваробы раслін*). Лясной гаспадарцы шкодзяць *губавыя грыбы*, якія разбураюць драўніну, псуюць лясныя пасадкі. Моцна шкодзяць і *дамавыя грыбы*, яны разбураюць драўляныя будынкі, шпалы, тэлегр. слупы. Некат. Г. выклікаюць хваробы чалавека і жывёлы. Гл. *Грыбковыя хваробы скуры, Мікозы* (парша, мікраспарыёз, лішай, актынамікоз і інш.).

Г. падзяляюцца на 4 класы: фікаміцэты, аскаміцэты, базідыяміцэты і дэўтэраміцэты. Першы клас — ніжэйшыя Г., 2, 3, 4-ы — вышэйшыя.

Фікаміцэты (Phycomycetes) — у большасці відаў грыбніца добра развітая, няклетачная, з мноствам ядраў у пратаплазме. Бясполае размнажэнне зааспорамі і спарангіяспорамі, у некат. канідыямі; полавае размнажэнне ўсіх тыпаў. Вядома каля 1000 відаў. Клас дзеліцца на 3 падклясы: архіміцэты, *ааміцэты* і зігаміцэты. Архіміцэты, хітрыдыевыя грыбы (Archimycetes) найб. прымітыўныя. Грыбніца зачаткавая або голы камячок пратаплазмы, які перад спараўтварэннем укрываецца абалонкай. Падклас уключае 3 парадкі: плазмадыяфаравыя, міксахітрыдыевыя і мікахітрыдыевыя. Большасць з іх унутрыклетачныя паразіты водарасцей і вышэйшых наземных раслін. Выклікаюць рак бульбы, кілу каранёў капусты, чорную ножку капусты і інш. Зігаміцэты (Zygomycetes) — сухапутныя Г., маюць добра развітую няклетачную грыбніцу, пашраны як сапрафіты на розных субстратах і паразіты пераважна на насякомых. Падклас уключае 2 парадкі: мукаравыя і энтамафторавыя. Мукаравыя — узбуджальнікі мукарміказу ў чалавека і жывёл і гнілі розных частак раслін. На садавіне, хлебе і інш. утвараюць белаватую або шараватую плесню. Энтамафторавыя Г.— паразіты насякомых.

Аскаміцэты, сумчатыя грыбы (Ascomycetes) — вялікі клас вышэйшых Г. Маюць шматклетачную грыбніцу і хіцін у абалонках клетак. Бясполае спараношэнне адбываецца канідыяспорамі, полавае — сумкаспорамі, кожная з якіх звычайна мае па 8 эндагенных аскаспораў. У больш простых Г. сумкі размешчаны на грыбніцы, у вышэйшых — у асобных пладовых целах. Вядома каля 25 тыс. відаў. Большасць аскаміцэтаў — сапрафіты, многія з іх паразіты раслін, чалавека і жывёл. Ёсць таксічныя, выклікаюць атручэнне с.-г. жывёл (эргатызм, клавіцэпстаксікоз). Клас падзяляецца на 2 падклясы: галасумчатыя і пладасумчатыя. Галасумчатыя, або першаснасумчатыя (Gymnoasci, ці Protascomycetes),— невялікая група Г., у якіх няма пладовых целаў і сумкі са спорамі ўтвараюцца на міцэлії. Сярод іх ёсць сапрафіты і паразіты. Падклас уключае 2 парадкі: першаснасумчатыя і экзааскавыя. З першаснасумчатых найб. важныя Г.— дрожджы. Экзааскавыя паразітуюць на дрэвах, выклікаюць іх хваробы (ведзьміны мётлы, кучаравасць лісця ў персіка, міндаля, «кішэнькі» ў слівы, чаромхі). Пладасумчатыя, або асабістасумчатыя (Carpoasci, ці Euascomycetes),— вялікая група Г., якія маюць пладовыя целы 3 тыпаў: клейстакарпіі (шарападобныя), перытэцыі (гарлачыкападобныя), апатэцыі (сподкападобныя). Па тыпе пладовага цела і размяшчэнні сумак у ім падклас дзеліцца на 3 групы: клейстаміцэты, пірэнаміцэты, дыскаміцэты. Сярод клейстаміцэтаў найб. важныя плесневыя Г. і паразітныя Г. сям. мучністарасяных (выклікаюць хваробу раслін — мучністую расу). Многія пірэнаміцэты — узбуджальнікі хвароб травяністых раслін і пладовых дрэў (спарыння, парша яблынь і груш, снежная плесня). Сярод дыскаміцэтаў ёсць ядомыя грыбы (смаржкі, трюфелі), паразітныя формы (узбуджальнікі гнілі саданіны, мокрай або белай гнілі агароднінных і палявых раслін, рака капюшыны).

Базідыяміцэты, базідыяльныя грыбы (Basidiomycetes) — вялікі разнастайны клас вышэйшых Г. Орган споранашэння ў іх — базідый, булавападобная або цыліндрычная клетка, радзей чатыры клеткі з тонкімі адросткамі (стэрыгмамі), на якіх размешчана па 2—4 споры (базідыяспоры). Істотная асаблівасць — 2 фазы развіцця грыбніцы: першасная гаплоідная (аднаядравая), недаўгавечная, развіваецца з базідыяспоры і другасная дыплоідная (двух'ядравая), вельмі жыццяздольная, узнікае з клеткі, утворанай у выніку сустрэчы канцоў гіфаў дзвюх суседніх першасных грыбніц; з яе пачынаюцца пладовыя целы, на якіх зверху або ўнутры развіваюцца базідыі. Пладовыя целы рознай формы: плоскія, канічныя, распасцёртыя па субстраце, падзеленыя на шапку і ножку; кансістэнцыя мясістая або дзеравяністая. Вядома каля 30 тыс. відаў. Сярод іх ядомыя (апенькі, баравік, ваўнянка, бялянка, валуй, падасінавік, падбярозавік, масляк і інш.); ядавітыя (мухаморы); узбуджальнікі хвароб с.-г. раслін (галаўнёвыя, іржаўныя); разбуральнікі драўніны (губавыя грыбы, дамавыя грыбы). Паводле будовы базідый падзяляюцца на 2 падклясы: холабазідыяміцэты і фрагмабазідыяміцэты. Холабазідыяміцэты (Holobasidiomycetes) маюць аднаклетачныя базідыі. Падклас уключае 1 парадак — экзабазідыевыя і групы парадкаў: гіменаміцэты (афілафоравыя і агарыкавыя) і гастэраміцэты. Экзабазідыевыя грыбы паразітуюць на вышэйшых раслінах. З гіменаміцэтаў большасць жыве сапрафітна на раслінных рэштках і глебе (шапкавыя грыбы); ёсць паразітныя віды, якія выклікаюць гніль драўніны (каранёвая губка). Гастэраміцэты — глебавыя грыбы, «грыбы-кветкі» з замкнутым пладовым целам, незвычайнай формы. Найб. пашараныя порахўкі. Фрагмабазідыяміцэты (Phragmobasidiomycetes) маюць шматклетачныя (чатырохклетачныя) базідыі. Іх падзяляюць на 4 парадкі: дрыжалкавыя і аўрыкулярыевыя (больш прымітыўныя, маюць пладовыя целы, большасць сапрафіты на драўніне); галаўнёвыя і ржаўныя (пладовых целаў не ўтвараюць, паразіты раслін).

Дэўтэраміцэты, недасканалыя грыбы (Deuteromycetes) — вялікая група Г. Міцэлій шматклетачны. Размнажаюцца канідыямі (бясполым споранашэннем). Не маюць дасканалай формы споранашэння (сумчатай і базідыяльнай). Вядома да 25 тыс. відаў. Многія паразітуюць на вышэйшых раслінах, выклікаюць гнілі, плямістасці, антракнозы, фузарыёзы. Ёсць глебавыя сапрафіты і грыбы з драпежнымі ўласцівасцямі. Дзеляцца на 3 парадкі: гіфаміцэты, меланканіевыя, сфероп сідныя.

Літ.: Комарницкий Н. А., Кудряшов Л. В. и Уранов А. А. Систематика растений, М., 1962; Комарова Э. П. Определитель трутовых грибов Белоруссии, Мн., 1964; Грибы наших лесов, 3 изд., Мн., 1970; Сержанина Г. И. Съедобные и ядовитые грибы. Определитель, Мн., 1967; Кудряшева З. Н. Микология с основами фитопатологии, Мн., 1968. *З. Н. Кудряшова.* Мінск.

ГРЫВА (Grīva) Жан [сапр. Фолманіс Жаніс Карлавіч; н. 24.11(7.12).1910, Курземе Айзупскай вол. Тукумскага пав.], латышскі савецкі пісьменнік. Засл. дз. культ. Латв. ССР (1962). Чл. КПСС з 1934. Сын парабка. У 1937—39 баец Інтэрнац. брыгады ў Іспаніі. Удзельнік Айч. вайны. Пасля вайны працаваў журналістам. Літ. дзейнасць пачаў у 1931. Першы зб. апавяд. «Па той бок Пірэнеяў» (1948) — пра змаганне ісп. рэспубліканцаў супраць фашызму. Рэвалюц. барацьбу латыш. народа адлюстраваў у рамане «Дарога жыцця» (1953), у драме «Мяце мяцеліца...» (1957). Аўтар раманаў «Любоў і нянавісць» (т. 1—2, 1961—62), «Дзеці зямлі» (1968), п'ес «Неспакойныя воды» (1960), «Злачынства ў Гранадзе» (1963), кнігі нарысаў пра рыбакоў «Пад крыламі альбатроса» (1956). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Бел. пер.— Пад небам Іспаніі, Мн., 1959; рус. пер.— Рассказы, Рига, 1960; Человек ли ты?, М., 1962; Человек ждет рассвета, М., 1970.

Літ.: Воробьева Н. Жан Грива, у кн.: Писатели народов СССР, М., 1962. *А. Я. Вілсан.* Рыга.

ГРЫГ (Grieg) Нурдаль (1.11.1902, Берген — 2.12.1943), нарвежскі пісьменнік. Выступіў у друку ў 1915. Быў юнгам (1920—21). Рамантыку мора і цяжкае жыццё матросаў паказаў у зб. вершаў «Вакол мыса Добрай Надзеі» (1922) і ў рамане «Карабель ідзе далей» (1924). Рэвалюц. ідэямі прасякнуты творы, напісаныя пад уплывам нац.-вызв. вайны ў Кітаі, які Г. наведаў як журналіст («Кітайскія дзённікі», 1927; алегар. п'еса «Варава», 1927). У 1932—34 жыў у СССР. Сімпатыі да сацыяліст. рэчаіснасці выказаў у арт. «Тэатр і жыццё» (1934), «У гадавіну рэвалюцыі» (1936). Заснаваў антыфаш. час. «Veien frem» («Шлях наперад», 1936—37), дзе друкаваліся

М. Горкі, М. Андэрсен-Нексё, Т. Ман і інш. прагрэс. пісьменнікі. Удзельнічаў у нац.-вызв. вайне іісп. народа (зб. арт. «Іспанскае лета», 1937; раман «Свет павінен быць яшчэ маладым», 1938), у 2-й сусв. вайне (зб. вершаў «Свабода», 1945; «Надзея», 1946). Аўтар п'ес «Наш гонар і наша магутнасць» (паст. 1936), «Паражэнне» (1937) і інш.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1956; Пьесы, М., 1960; Избр. лирика, М., 1969.
Літ.: Крымова Н. И. Нурдаль Григ, М., 1965; Нурдаль Григ. Биобиблиогр. указатель, М., 1958.

ГРЫГ (Grieg) Эдвард Хагеруп (15.6.1843, Берген — 4.9.1907), нарвежскі кампазітар, піяніст, дырыжор, крытык, музычны дзеяч. Пачынальнік нарвежскай нац. муз. класікі. Скончыў Лейпцыгскую кансерваторыю (1862), заснаваў (разам з Р. Нурдракам) музычнае т-ва «Эўтэрпа» ў Капенгагене (1864), Муз. акадэмію ў Хрысціяніі (1866), у 1880—82 кіраваў муз. т-вам «Гармонія» ў Бергене. Увасабляў у музыцы нац. тыпы, карціны прыроды і нар. быту, вобразы парв. фальклору. У творчасці пераважаюць камерныя жанры: праграмная фп. мініяцюра [10 сшыткаў «Лірычных п'ес», цыклы «Паэтычныя карцінкі», «Сцэны з народнага жыцця», «Нарвежскія танцы і песні», «Нарвежскія сялянскія танцы» («Слоты») і інш.], песня і раманс, інстр. ансамбль (2 квартэты, саната для віяланчэлі і фп., 3 санаты для скрыпкі і фп.). З арк. твораў найб. вядомыя сімф. сюіты з музыкі да драм «Сігурд Юрсальфар» Б. Б'ёрнсана і «Пер Гюнт» Г. Ібсена (у Бел. т-ры оперы і балета пастаўлены балет «Пер Гюнт» на музыку Г.) і апрацоўкі фп. музыкі (сюіта для струннага арк. «З часоў Хольберга», 1885, і інш.). Багаццем вобразных кантрастаў, віртуознасцю, яркім нац. каларытам вызначаецца канцэрт для фп. і арк. (1868).



Літ. тв.: Избранные статьи и письма, М., 1966.
Літ.: Асафьев Б. В. Григ, М.— Л., 1948; Левашева О. Эдвард Григ, М., 1962.

ГРЫГАРАВІЧЫ, вёска ў Валасовіцкім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса «Грыгаравічы». За 28 *км* на ПдУ ад Лепеля, 145 *км* ад Віцебска, на шашы Лепель — г. п. Халопенічы. 112 ж., двароў 36 (1971). Васьмігадовая школа, фельч.-ак. пункт, сталовая, магазін.

ГРЫГАРОВІЧ Дзмітрый Васілевіч [19(31).3. 1822, Сімбірск — 22.12.1899(3.1.1900)], рускі пісьменнік. З сям'і памешчыка. Вучыўся ў інжынерным вуч. і ў Акадэміі мастацтваў (Пецярбург, 1836—40). Служыў у Дырэкцыі імператарскіх т-раў. У 60—80-я г. сакратар Т-ва заахвочвання мастацтваў. Найб. значныя аповесці «Вёска» (1846) і «Антон-Гаротнік» (1847) выкрываюць дэспатызм, паразітызм памешчыкаў. У раманах «Рыбакі» (1853) і «Перасяленцы» (1855—56) праўдзіва апісана жыццё сялян, ёсць вялікі этнагр. матэрыял. Дарожныя нарысы «Карабель «Рэтвізан» — вынік марскога падарожжа Г. ў 1858—59. Аповесць «Гутаперчавы хлопчык» малюе трагічны лёс дзіцяці-акрабата ў цырку.

Тв.: Избранные произведения, М.— Л., 1959; бел. пер.— Гутаперчавы хлопчык, Мн., 1938; Антон-Гаротнік, Мн., 1953.

ГРЫГАРОВІЧ Іван Іванавіч [26.8(6.9).1792, Прапойск Магілёўскай губ.— 1(13).11.1852], беларускі гісторык афіцыйна-дваранскага кірунку, археограф і моваznавец. Ганаровы чл. Казанскага ун-та (1848). З сям'і свяшчэнніка. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1819). Выкладаў грэч. і лац. мовы ў Магілёўскім духоўным вуч. (1811—15). Протаіерэй царквы і рэктар павятовага і прыхадскога вуч. у Гомелі (з 1819) і Віцебску (з 1829). З 1831 у Пецярбурзе. Чл. (з 1837) і гал. рэдактар (з 1839) *Археаграфічнай камісіі*. Сабраў і выдаў першы бел. археаграфічны зб. «Беларускі архіў старажытных грамат», рэдактар «Актаў гістарычных» (т. 1—4, 1841—42) і *«Актаў Заходняй Расіі»* [т. 1—4, 5 (частkова), 1846—53], склаў «Слоўнік заходнерускай гаворкі» (А, Б, В) і «Збор слоў літоўскарускай (беларускай) гаворкі». Даследаваў гісторыю бел. царквы і наўгародскіх пасаднікаў. Архіў Г. ў Цэнтр. дзярж. архіве л-ры і мастацтва БССР.

Тв.: Известие о древнем храме Христа Спасителя, построенном в XII веке преподобною Ефросиньею близ Полоцка, Сочинения духовного содержания..., СПб., 1862.
Публ.: Белорусский архив древних грамот, ч. 1, М., 1824; Переписка пап с российскими государями в XVI веке..., СПб., 1834; Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа белорусского. С портретом его и жизнеописанием, 2 изд., ч. 1—2, СПб., 1861.
Літ.: Григорович Н. Очерк жизни протопереп Иоанна Иоанновича Григоровича, «Странник», 1861, т. 2, июнь; Суднік М. Збіральнік беларускай старажытнасці, «Беларусь», 1945, № 11—12.
П. Р. Казлоўскі, І. К. Германовіч. Мінск.

ГРЫГАРОВІЧ Леанід Андрэевіч (н. 1916, Масква), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15—16.10.1943 батальён на чале з Г. фарсіраваў Дняпро, захапіў варожыя траншэі, авалодаў вышынёй на ПдЗ ад Лоева; 17—18.10.1943 адбіў 10 контратак праціўніка. Жыве ў Маскве.

ГРЫГАРОВІЧ Міхаіл Фролавіч [19.9(1.10). 1897, в. Малыя Кавалевічы Гродзенскага пав.— 24.11.1946], Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1920. З кастр. 1917 чырвонагвардзеец. У Чырв. Арміі з 1918. У грамада. вайну ўдзельнічаў у баях на Зах. фронце, у разгроме бандаў Булак-Балаховіча. У Айч. вайну камандаваў корпусам, вызначыўся ў баях на Львоўскім напрамку. Удзельнічаў у вызваленні Чэхаславакіі, Венгрыі.



ГРЫГАРОВІЧ Юрый Мікалаевіч (н. 2.1. 1927, Ленінград), рускі савецкі балетмайстар і артыст балета. Нар. арт. РСФСР (1966). Скончыў Ленінградскае харэагр. вучылішча (1946). Характарны танцоўшчык у т-ры імя Кірава; адзейсніў тут першыя значныя пастаноўкі («Каменная кветка» С. Пракоф'ева, 1957; «Легенда пра каханне» А. Мелікава, 1961). З 1964 гал. балетмайстар Вял. т-ра СССР, дзе стварыў новыя харэагр. рэдакцыі балетаў П. Чайкоўскага («Спячая красуня», 1963; «Шчаўкунок», 1966; «Лебядзінае возера», 1969), паставіў «Спартака» А. Хачатурана (1968, Ленінская прэмія 1970). У работах сцвярджае сімфанізм і скразную танцавальнасць балетнага спектакля, філас. характар харэагр. вобразаў.

Літ.: Вансловв. Балеты Григоровича и проблемы хореографии, М., 1968.

ГРЫГАР'ЯНЦ Армен Багратавіч [н. 15(28). 9.1918, Андыжан], беларускі савецкі мастак тэатра і кіно. Засл. дз. маст. БССР (1955). Скончыў Ленінградскае маст.-пед. вучылішча (1939). Працаваў у т-рах Ташкента, Вільнюса і інш. У 1953—62 гал. мастак Рус. драм. т-ра БССР імя М. Горкага, з 1962 гал. мастак т-ра імя Я. Купалы. Сярод спектакляў, аформленых у Мінску: «Кароль Лір» У. Шэкспіра (1953), «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага (1956) — Рус. т-р; «Салавей» З. Бядулі (1956), «Забыты ўсімі» Назыма Хікмета (1958), «Чацвёрты» К. Сіманава (1962), «Я, бабуся, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Р. Лордкіпанідзе, «У мяцеліцу» Л. Лявонава (абодва 1965), «Людзі на балоце» паводле І. Мележа (1966, з Б. Герлаванам), «Рудабельская рэспубліка» паводле С. Грахоўскага (1968) — т-р імя Я. Купалы; «Багема» Дж. Пучыні (1968, т-р оперы і балета); мастак і рэж. спектакляў «Матухна Кураж і яе дзеці» Б. Брэхта (1962, Рус. т-р) і «Цудоўная дудка» В. Вольскага (1968, Т-р юнага гледача). Аформіў кінафільмы «Чырвонае лісце» (1957) і «Палеская легенда» (1964, з У. Белавусавым) і інш. Дэкарацыям Г. ўласцівыя яснасць планіровачнага вырашэння, манументальнасць і эмац. выразнасць, адчуванне эпохі. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

П. А. Карнач. Мінск.

А. Б. Грыгар'яніц. Эскіз дэкарацыі да спектакля «Кароль Лір».



ГРЫГОНІС Генрых Юр'евіч [8(20).5.1889, Падбярэззе Віленскага пав.— 4.11.1955], беларускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1941). Акцёрскую дзейнасць пачаў у 1907 у прыватных т-рах Д. Усходу, куды трапіў, плаваючы юнгам на караблях рус. гандлёвага флоту. Вярнуўшыся на радзіму, працаваў у Першым т-ве бел. драмы і камедыі (1918—20), з 1920 у БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы). Народнасцю, сакавітым гумарам, яркімі сцэнічнымі фарбамі вызначаліся ролі Г. ў камед. рэпертуары: Пустарэвіч («Паўлінка» Я. Купалы), Даніла («На купалле» М. Чарота), Дораш, Каваль («Машэка», «Каваль-ваявода» Е. Міровіча), Нічыпар («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Бублік, Галушка («Платон Крэчат», «У стэпах Украіны» А. Карпейчука). У класічным рэпертуары асаблівы поспех меў у ролі Журдэна («Мешчанін у дваранах» Мальера). Псіхал. глыбінёй і тыповымі рысамі характару вызначаліся вобразы Мураўёва («Кастусь Каліноўскі» Міровіча), Лукі («На дне» М. Горкага), Чужакова («Мост» Я. Рамановіча), Фірса («Вішнёвы сад» А. Чэхава). Здымаўся ў кіно («Дняпро ў агні», 1937, і інш.). Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.





Г. Ю. Грыгоніс у ролях Журдэна і Нічыпара.

Літ.: Вішкароў Б. Генрых Юр'евіч Грыгоніс, у кн.: Мастацтва Савецкай Беларусі, Мн., 1955; Есакоў А. Генрых Грыгоніс, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967. *Я. С. Рамановіч.* Мінск.

ГРЫГОР НАРЭКАЦЫ (951—1003), армянскі паэт, багаслоў. З сям'і вучонага і царк. пісьменніка Хасрова Андзевацы. Вучыўся ў манастыры Нарэка, дзе пасля быў выкладчыкам. Пісаў гандзы (гімны ў гонар бога і святых), тагі (песні) і мегеды. Праславіўся лірыка-містычнай паэмай «Нарэк» («Кніга смутку»), у якой, побач з рэліг. матывамі, упершыню ў арм. л-ры аб'ектам маст. творчасці зрабіў чалавека і яго пачуцці. Творчасць Г. Н. адыграла вял. ролю ў развіцці арм. літаратурнай мовы.

Тв.: Рус. нар.— Шевцов Армений. С древнейших времен до наших дней, под ред. В. Брюсова, М., 1916.

ГРЫГОР'ЕЎ Аляксандр Іванавіч (н. 9.8. 1923, в. Багаслоўка Жэрмаўскага пав. Тульскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1966). Чл. КПСС з 1948. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся 22.6.1944 на прарыве абароны праціўніка каля в. Сіроціна і 25.6.1944 пры фарсіраванні Зах. Дзіны каля в. Балбетна Віцебскай вобл. На захопленым плацдарме адбіў 2 контратакі ворага. Жыве ў Маскве.

ГРЫГОР'ЕЎ Андрэй Аляксандравіч [20.10 (1.11).1883—2.9.1968], савецкі географ. Акад. АН СССР (1939). Чл. КПСС з 1946. Арганізатар і кіраўнік (да 1951) ін-та геаграфіі АН СССР, гал. рэдактар Кароткай геагр. энцыклапедыі. Праводзіў даследаванні на поўначы СССР, Урале, у Якуціі. Працы прысвечаны прынцыпам і метадам фіз.-геагр. раянавання, характарыстыцы асн. тыпаў геагр. асяроддзя, агульнай тэорыі фіз. геаграфіі, гісторыі развіцця геагр. думкі. Дзярж. прэмія СССР 1947. Залаты медаль імя М. М. Пржавальскага (1928), Вялікі залаты медаль Геагр. т-ва СССР (1965).

Тв.: Типы географической среды, М., 1970.

ГРЫГОР'ЕЎ Апанас Ісакавіч [н. 4(17).2. 1914, в. Другая Спорная Чалябінскага пав.], удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1945. З 1933 служачы. У Чырв. Арміі з 1937. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. З ліп. 1942 камандзір партыз. атрадаў імя Кірава, потым імя Суворава. Са студз. 1944 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Дрысенскай* Віцебскай вобл. З вер. 1944 на сав. і гасп. рабоце ў Дрысенскім (з 1962 Верхнядзвінскім) р-не. Узнаг. 2 ордэнамі.

ГРЫГОР'ЕЎ Георгій Сцяпанавіч (1924, в. Лажкі Мажайскага пав. Маскоўскай губ.— 20.1.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся 20.1.1944 каля Віцебска. З групай разведчыкаў захапіў 2 палонных і станковы кулямёт. У бай цяжка паранены, але крыў сваім агнём варожы кулямёт. Пахаваны ў в. Шапуры Віцебскага р-на.

ГРЫГОР'ЕЎ Дзмітрый Пятровіч (н. 5.1. 1920, в. Вымец Духаўшчынскага пав. Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1950. У Чырв. Арміі з 1940. З кастр. 1941 да лютага 1943 узначальваў партыз. атрад імя Фурманава ў Смаленскай вобл. У час Беларускай аперацыі 1944 ст. лейтэнант Г. камандаваў дэсантнай групай аўтаматчыкаў. 29.6. 1944 дэсантнікі захапілі мост цераз Вярэзіну каля Бабруйска, абараняючы яго, адбілі жорсткую атаку ворага. Жыве ў г. Ярцава Смаленскай вобл.

ГРЫГОР'ЕЎ Леанід Міхайлавіч [31.7(13.8). 1913, с. Дабранка Гарадзянскага пав. Чарнігаўскай губ.— 6.10.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся 29—30.9.1943 у Камарынскім р-не Палескай вобл. Рота на чале з лейтэнантам Г. па падручных сродках фарсіравала Дняпро, захапіла плацдарм, на 2 суткі адбіла 20 контратак праціўніка. Загінуў у бою.

ГРЫГОР'ЕЎ Самуіл (Самошка; к. п. і сл. невід.), беларускі і рускі майстар па кафлі 2-й пал. 17 ст. Ураджэнец Копася. З мінчан. У 1654 уладыка патрыярхам Ніканам у Валдайскі Іверскі манастыр для «цанінной справы», потым на будоўлю Ново-Іерусалімскага храма на Істры. Працаваў у Аружэйнай палаце ў Маскве. У 1667—68 вырабіў кафлі для Каломенскага палаца цара Аляксея Міхайлавіча.

ГРЫГОР'ЕЎ Юрый Пацелаймонавіч (н. 29.5.1932, нас. Кулочына Акулаўскага р-на Ленінградскай вобл.), беларускі савецкі архітэктар. Чл. КПСС з 1965. Скончыў Маск. арх. ін-т (1956). Працаваў у Белдзяржпраекце, з 1961 у Мінскпраекце (з 1965 кіраўнік арх.-канструктарскай майстэрні). Удзельнік распрацоўкі ген. планаў і праектаў Беларускага аўтазавода (Жодзіна), Гомельскага з-да электраапаратуры, Салігорскай і Светлагорскай будаўнічых зон (1956—61). Па праектах Г. ў Мінску пабудаваны: студэнцкія гарадкі БДУ (1964, з арх. Н. Шпігельманам) і Бел. політэхн. ін-та (1969, з арх. С. Мусінскім і Л. Архангельскай), шэраг будынкаў ін-таў АН БССР, Ін-т эканомікі і эканоміка-матэм. метадаў планавання пры Дзяржплане БССР (усе 1966) і інш. Саўтар праектаў планіроўкі і забудовы мікрараёнаў у Мінску (Чыжоўка, Зялёны Луг, Цнянскі і інш.).

ГРЫГУЛІС (Grigulis) Арвідс Петэравіч (н. 12.10.1906, маёнтак Юмпраўмуйжа Вольмарскага пав. Ліфляндскай губ.), латышскі савецкі пісьменнік і літаратуразнавец. Канд. філал. н. (1961). Засл. дзеяч культ. Латв. ССР (1947). Чл. КПСС з 1954. З сялян. Скончыў Латв. ун-т (1937), там працуе з 1945 выкладчыкам. У Айч. вайну франтавы карэспандэнт. Друкуецца з 1927. Першыя кнігі — зб. вершаў «Нататкі рэпарцёра» (1929), «Імітацыя і сэрца» (1931), раман «Людзі ў садзе» (1939). Творчы росквіт пачынаецца з 40-х г. Выдаў зб. вершаў «У завіруху» (1946), «Асенні дождж» (1966), «Вецер пяе ў прыбярэжных вербах» (1968), кн. апавяд. «Праз агонь і ваду» (1945), раман «Калі дождж і вецер б'юць у акно» (1965), п'есы «У якую гавань?» (1945), «Гліна і фарфор» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1948), «Салдацкі шынель» (1955). Пераклаў «Слова аб палку Ігаравым» (1950). Склаў зб. «Латышская літаратурная крытыка» (т. 1—5, 1956—64).

Тв.: Бел. пер. у кн.— Ветрык, вей, Мн., 1959; Латышские анавядданні, Мн., 1956; рус. пер.— Сквозь огонь и воду. Рассказы, 1947; Ветви сирени. Стихи, Рига, 1961; Как Артур делал карьеру, Рига, 1962.

А. Л. Вілсан. Рыга.

ГРЫДЗІН Дзмітрый Аляксеевіч [н. 22.11 (5.12).1911, с. Мядзведжынае Мядзведжынскага пав. Стаўрапольскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1940. На фронце з 1941. Вызначыўся 29—30.9.1943 каля Камарына Палескай вобл. На падручных сродках пераправіў на зах. бераг Дняпра батарэю, агнём

якой памог палку фарсіраваць раку і замацавацца на плацдарме. Жыве ў г. Георгіеўск Стаўрапольскага краю.

ГРЫЖА (кіла), выпучванне ўнутраных органаў або іх тканак праз натуральныя ці штучныя адтуліны (грыжавыя вароты) разам з брушынай пад скуру (вонкавая Г.) або міжмышачную клятчатку (унутраная Г.).

Бывае прыроджаная і набытая. Паводле локалізацыі адрозніваюць Г. жывата, галаўнога і спінного мозгу, мышцаў. Утварэнню набытай Г. садзейнічаюць прыроджаная слабасць пэўных анатамічных абласцей, цяжкая фіз. праца, запаволенне, траўмы. Найчасцей бываюць Г. жывата: пахвінная, сцегнавая, пупочная, белай лініі, пасляаперацыйная (на месцы рубца). Лячэнне Г. хірургічнае. Заснавальнікам яго на Беларусі быў бел. хірург К. І. *Грум-Гржымайла.* Хворым, якім процінаказана аперацыя, носяць бандаж. Прафілактыка: рацыянальны рэжым фіз. працы, фізкультура.

Літ.: Маят В. С. Грыжи живота, у кн.: Многотомное руководство по хирургии, т. 7, Л., 1960; Острые заболевания и повреждения органов пищеварения, Мн., 1967. *І. М. Стальмашонак.* Мінск.

ГРЫЗАДУБАВА Валянціна Сцяпанаўна [н. 18(31).12.1910, Харкаў], удзельніца баёў за вызваленне Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1938). З служачых. Чл. КПСС з 1941. Скончыла Тульскую лётную шк. (1933). У 1934—38 лётчык агіт. эскадрыллі імя М. Горкага. Устанавіла 5 міжнар. жаночых рэкордаў на спарт. самалётах. За пералёт Масква — Камсамольск-на-Амуры 24—25.9.1938 экіпажу ў складзе Г., П. Дз. *Асіпенкі*, М. М. *Расковай*, першым з сав. жанчын, прысвоена званне Героя Сав. Саюза. З 1938 нач. Упраўлення міжнар. паветр. ліній ГПФ СССР. У Чырв. Арміі з чэрв. 1941, камандзір карабля Маск. авіяц. групы спец. прызначэння. У сак. 1942 — чэрв. 1944 камандзір 101-га авіяц. палка далёкага дзеяння, самалёты якога дастаўлялі войскам боепрыпасы, лёталі ў тыл ворага да бел. партызанаў, удзельнічалі ў *Беларускай аперацыі 1944* і бамбілі войскі ворага ў раёнах Бабруйска, Обаля, Рагачова, Полацка, Барысава, Оршы, Ліды. Жыве ў Маскве.



Літ.: Героини, в. 1, М., 1969, с. 133—142.

В. В. Тараканаў. Падольск.

ГРЫЗУНЫ (Rodentia, Glires), атрад млекакормячых. Вядома каля 2800 відаў (30 сям.), пашыраных на ўсіх мацерыках (акрамя Антарктыды). У СССР 113 відаў, 12 сям.: вавёркавыя (гл. *Вавёркі*), *палятухі*, *бабры*, *дзікабразавыя*, нутрыевыя (гл. *Нутрыя*), *марскія свінкі*, соні, селявіневыя, тушканчыкавыя (гл. *Тушканчыкі*), мышоўкавыя (гл. *Мышоўкі*), мышыныя (гл. *Мышы*), слепаковыя (гл. *Слепакі*). На Беларусі 6 сям.: (вавёркавыя, бабры, нутрыевыя, соні, мышоўкавыя, мышыныя).

Даўж. ад 5 см (мыш-малютка) да 1 м (дзікабраз). Маюць зубную сістэму, прыстасаваную да жавуляння раслінай ежай (добра развітыя разцы на пары ў верхняй і ніжняй сківіцы ўвесь час растуць і востраццца пры сціранні; іклаў няма; карэнныя зубы адрозніваюцца ад рэшткаў прамежкам — дыястэмай і маюць шырокую жавальную паверхню). Другая асаблівасць Г.— значная даўж. кішэчніка і наяўнасць слепой кішкі (характэрная прыкмета травяных жывёл). Жывуць Г. на зямлі (тушканчыкі), на дрэвах (вавёркі, соні), пад зямлёй (слепакі), радзей на вадзе (*бабёр*). Суркі, *суслікі*, *хамякі*, тушканчыкі, соні зімою спяць; *бурундукі*, вавёркі, пясчанкі на зіму назапашваюць корм; *лемінгі*, *палёўкі* перасяляюцца. Г. вельмі плодныя. Маюць вял. значэнне ў прыродзе: імі кормяцца драпежныя птушкі і капытныя млекакормячыя (напр., пясец, куніца, гарнастай, сабаль), удзельнічаюць у глебаўтварэнні і інш. Нарасп. значэнне Г. розпае: вавёрка, бабёр, андатра — каштоўныя прамысл. жывёлы; палёўкі, мышы, пацукі, хамякі, суслікі шкодзяць сельскай і лясной гаспадарцы, псуюць прадукты, а таксама разносяць туларэмію, хваробу Аўескі, чуму, шалейства і інш. заразныя хваробы. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Виноградов Б. С. и Громов И. М. Грызуны фауны СССР, М.—Л., 1952; Бобринский Н. А., Кузнецов Б. А. и Кузякин А. П. Определитель млекопитающих СССР, 2 изд., М., 1965; Сержанин И. И. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961.

В. Ф. Цераховіч. Мінск.

ГРЫЛЬПАРЦЭР (Grillparzer) Франц (15.1. 1791, Вена — 21.1.1872), аўстрыйскі пісьменнік, заснавальнік нац. аўстрыйскай л-ры. З сям'і адваката. У драматургіі Г. ўплыў асветніцкай л-ры 18 ст. спалучаецца з рамант. тэндэнцыямі; асн. тэма — трагічная віна і гібель індывіда, які прыходзіць у супярэчнасць з грамадствам (драма «Прамаці», 1817; трагедыя «Сафо», 1819; гістар. драма «Веліч і падзенне караля Атакара», 1825). У драме «Лібуша» (нап. 1848, апубл. 1872) крытыкуе бурж. «прагрэс». Сац.-крытычныя матывы ўласцівыя і прозе Г. (аповесць «Бедны шпільман», 1848; дзённікі і аўтабіягр. нататкі).

Тв.: Рус. пер.— Пьесы, Л.—М., 1961.

ГРЫМ (франц. grime, ад стараітальян. grimo маршчыністы), мастацтва змяняць выгляд акцёра, найчасцей яго твар, з дапамогаю спец. фарбаў, пластычных і валасяных наклеек, парыка, прычоскі і інш. Характар Г. залежыць ад маст. асаблівасцей п'есы (кінаці тэлесцэнарыя), акцёрскага замыслу, рэжысёрскай канцэпцыі і стылю афармлення спектакля (кінафільма).

Гісторыя Г. ідзе ад нар. абрадаў і гульняў, якія патрабавалі ад удзельнікаў вонкавага пераўвасаблення. Нар. акцёры — скамарохі, жанглёры і г. д. размалёўвалі твары сажаю, фарбавальным сокам раслін. Прымітыўна-рэаліст. Г. карысталіся ўдзельнікі сярэдневяковага т-ра. Ідэалізаваны Г. створаны т-рам класіцызму. Развіццё рэалізму ў т-ры абумовіла росквіт мастацтва Г.: ствараецца Г.-партрэт, які абагульняў у сабе індывідуальныя і сац. рысы вобраза.

Літ.: Станиславский К. С. Моя жизнь в искусстве, М., 1962; Ленский А. П. Заметки о мимике и гриме, у яго кн.: Статьи. Письма. Записки, 2 изд., М., 1950; Львов Н. А. О гриме, М., 1969; Раугул Р. Д. Грим, 2 изд., Л.—М., 1947; Школьников С. П. Искусство грима, Мн., 1963; яго ж. Грим, Мн., 1969.

ГРЫМ (Grimm), браты Якаб (4.1.1785, г. Ханаў — 20.9.1863) і Вільгельм (24.2.1786, г. Ханаў — 16.12.1859), нямецкія філолагі. Члены Берлінскай АН (з 1841). З сям'і чыноўніка. Па адукацыі юрысты. Прафесары Гётынгенскага і Берлінскага ун-таў. Збіралі і выдавалі сярэдневяковыя нямецкія творы («Праставянямецкі майстэрзэанг», 1811; «Рэйнеке Ліс», 1834, і інш.) і нямецкі фальклор («Дзіцячыя

і сямейныя казкі», т. 1—2, 1812—15; «Нямецкія паданні», т. 1—2, 1816—18). Якаб Г.— аўтар даследаванняў «Нямецкая міфалогія» (1835), «Гісторыя нямецкай мовы» (т. 1—2, 1848), «Нямецкая граматыка» (т. 1—4, 1819—37). Прыхільнікі параўнальных метадаў у мовазнаўстве і т. зв. *міфалагічнай школы* ў фальклярыстыцы.

Тв.: Бел. пер.— Казкі братоў Грым, Мн., 1937; рус. пер.— Сказки, Мн., 1967.

ГРЫМ (Grimm) Ганс-Іоахім (н. 16.10.1932, Магдэбург), нямецкі пісьменнік-неракладчык. З сям'і рабочага. Скончыў ун-т імя К. Маркса ў Лейпцызе (1955). У 1955—59 перакладчык Гандлёвага прадстаўніцтва ГДР у Маскве, 1959—64 супрацоўнік Бюро перакладаў у Берліне. Перакладае з рус., бел., укр., польскай, сербскахарвацкай і інш. слав. моў. Пераклаў «Беларускія народныя казкі» (1—4 выд., 1966—70), «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля (1968), апавяданні В. Быкава, У. Галубка, Ц. Гартнага, І. Мележа, А. Пальчэўскага, Э. Самуйлёнка, В. Сташэўскага.

ГРЫМАЛЬДЗІЦЫ, выкапнёвыя людзі позняга палеаліту. Шкілеты (20) знойдзены ў 1872—1906 у пячорах Грымальдзі на ўзбярэжжы Міжземнага м. каля г. Ментоны. Большасць шкілетаў краманьёнскага тыпу, 2 (старой жанчыны і юнака) — негроідна-еўрапеоіднага тыпу. Знаходкі пацвярджаюць капцэпцыю першапачатковага раздзялення чалавецтва на продкаў мангалоідаў і агульных продкаў еўрапеоідаў і негроідаў, якія пазней утварылі 2 самастойныя расы.

Літ.: Нестурх М. Ф. Приматология и антропогенез, М., 1960.

ГРЫМАЎ ГАРСІЯ (Grimau Garcia) Хуліян (18.2.1911—20.4.1963), дзеяч іспанскага камуністычнага руху. Па прафесіі друкарскі рабочы. З 1936 чл. кампартыі Іспаніі. У нац.-рэвалюц. вайну 1936—39 змагаўся ў рэсп. арміі. Пасля падзення рэспублікі эміграваў на Кубу, пазней вярнуўся на радзіму. У 1954 і 1960 на з'ездах кампартыі Іспаніі выбіраўся чл. пе ЦК. 7.11.1962 арыштаваны. Спец. ваен. трыбунал у Мадрыдзе вынес па фальшывым абвінавачанні смяротны прыгавор Г. Г. У апошнім слове ён сказаў: «Дваццаць пяць гадоў я быў камуністам і памру камуністам». Рух у абарону Г. Г. ахапіў многія краіны свету, аднак іспанскія фашысты прывялі прыгавор у выкананне.

Літ.: Непомнящий К. Е. Повесть о Хулиане Гримау, у яго кн.: Коммунисты, М., 1967.

ГРЫМУЧЫЯ ЗМЕІ, ямкагаловыя (Crotalidae), сямейства ядавітых змеяў атр. лускаватых. Вядома 6 родаў і каля 120 відаў, пашыраных у Амерыцы і Азіі. У СССР (у Сярэдняй Азіі, на Урале і Д. Усходзе) 2 віды: усходні шчытаморднік (Ancistrodon blomhoffi) і Паласаў шчытаморднік (A. halys).

Даўж. цела да 4 м. На галаве ямка з органам («тэрмічнае вока»), які ўспрымае цеплавыя (інфрачырвоныя) прамяні і гэтым памагае знаходзіць ежу ў цемнаце. На верхняй сківіцы ядавітыя зубы. У некат. відаў на канцы хваста бразготка з рагавых конусаў (відазмененая луска), ад трэння якіх утвараюцца гукі (адсюль назва). Жывуць Г. з. ў трапічных лясах, пустынных і пустынях; некат. у горах. Кормяцца дробнымі млекакормячымі, птушкамі, жабамі. Яйцажывародныя. Небяспечныя

чалавеку і свойскай жывёле. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Змеі*.

Літ.: Терентьев П. В. Герпетология, М., 1961; Жизнь животных, т. 4, ч. 2, М., 1969.


ГРЫН Аляксандр Сцяпанавіч [сапр. прозвішча Грыневіцкі; 11(23).8.1880, Вятка — 8.7.1932], рускі савецкі пісьменнік. Сын паляка, паўстанца 1863, сасланага ў Сібір. Шмат вандраваў па Расіі, быў у ссылцы. Друкавацца пачаў у 1906. Услаўляў чалавека і чалавечую мару. Рамант. прыўзнятасць, дынамічнасць сюжэта, псіхалагізм абумовілі шырокую папулярнасць яго аповесці «Пунсовыя ветразі» (1923, экранізаваная), раманаў «Тая, што бяжыць па хвалях» (1928, экранізаваны), «Дарога нікуды» (1930) і інш. твораў.

Тв.: Собр. соч., т. 1—6, М., 1965.

Літ.: Ковский В. Е. Романтический мир Александра Грина, М., 1969.

ГРЫНВІЧСКАЯ АСТРАНАМІЧНАЯ АБСЕРВАТОРЫЯ, найстарэйшая абсерваторыя ў Англіі, засн. ў 1675 у Грынвічы (прадмесце Лондана). У 50-х г. 20 ст. пераведзена ў замак Хёрстмансо, за 70 *км* ад Лондана. Даследуе рух і становішча зорак, Сонца і планет, вымярае паралаксы зорак і інш. Праз Грынвіч праходзіць нулявы мерыдыян (грынвічскі), мясцовы час якога прыняты за сусветны і ад якога вядзецца лік даўгаты на зямной паверхні.

ГРЫНЁВІЧ Антон Антонавіч (3.5.1877, фальварак Іваноўшчына Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 8.12.1937), збіральнік беларускага музычнага фальклору, выдавец. Чл. выдавецкага т-ва *«Загляне сонца і ў наша аконца»*. У 1910 засн. у Пецярбурзе сваё выдавецтва (Выдавецтва Антона Грынёвіча), якое выпускала творы бел. л-ры і музыкі. У муз. зборнікі ўключаў запісаныя ім бытавыя, каляндарна-абрадавыя, дзіцячыя і інш. бел. нар. песні, песні на словы Я. Купалы, Я. Коласа, Г. Леўчыка, музыку да якіх пісаў сам. Сабраў і выдаў: «Беларускія песні з нотамі» (т. 1, 1910; т. 2, разам з А. Зязюлем, 1912), «Народны спеўнік» (Вільня, 1920) і «Школьны спеўнік» (Вільня, 1920), «Беларускі дзіцячы спеўнік» (Вільня, 1925). Напісаў для бел. сярэдніх і пач. школ падручнік «Навука спеву» (Вільня, 1923). З 1920 жыў у Вільні, з 1925 у Мінску. У 1925—28 працаваў у Інстытуце беларускай культуры, у 1929—30 у АН БССР. Выступаў з артыкуламі ў бел. перыяд. друку. У 1925 у час. «Наш край» апублікаваў «Праграму-інструкцыю для збіральнікаў беларускай музычна-этнаграфічнай творчасці».



Літ.: Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць, Мн., 1968, с. 179—190; Ліс А. Песня прасілася ў свет, «Полымя», 1966, № 2.

А. С. Ліс. Мінск.

ГРЫНЁВІЧ (Грынкевіч) Тамаш Міхайлавіч [1815—16(28).7.1863], удзельнік паўстання 1863 на Беларусі. Уладальнік маёнтка Верхняя Тошчыца ў Рагачоўскім пав. Магілёўскай губ. У 1834—44 на ваен. службе. У крас. 1863 арганізаваў і ўзначаліў паўстанцкі атрад у Рагачоўскім павеце. Схоплены карнікамі і паводле прыгавору ваен. суда расстраляны ў Рагачове.

Літ.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе, Мн., 1969, с. 168.

ГРЫНЁЎ Міхаіл Андрэевіч (н. 10.9.1922, в. Прылепы Арлоўскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з сак. 1942. Вызначыўся 24—25.7.1944 каля Брэста. Разлік гарматы пад камандаваннем Г. адбіў 11 контратак, знішчыў 3 танкі, 4 гарматы, 40 аўтамашын праціўніка. Жыве ў Малаархангельску Арлоўскай вобл.

ГРЫНКІ 1-я, вёска ў Дабравольскім с/с Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Аляксандра Неўскага. За 10 *км* на Пд ад Свіслачы, 106 *км* ад Гродна. 573 ж., гасп. 247 (1971). Сярэдняя школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Ням.-фаш. захопнікі забілі 32 мірных жыхароў вёскі. Помнік землякам і сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГРЫНЦЭВІЧ Людвік (1717—10.10.1783), літоўскі і беларускі архітэктар. Прадстаўнік позняга барока. Удзельнічаў у рэканструкцыі ц. місіянераў у Вільні (1753), стварыў дамініканскія цэрквы ў Расіняе (1776—83) і Вірбаліне (1783). Сярод работ на Беларусі: бернардзінскі касцёл у Друі (1763, з арх. Параца), двухвежавы фасад і гал. алтар дамініканскай ц. ў Валынцы (1764—66), манастыр дамініканцаў у Нясвіжы (80-я г.) і інш.

ГРЫНЧЫК Мікалай Міхайлавіч (н. 1.8.1923, мяст. Быцень), беларускі савецкі літаратуразнавец і крытык. Д-р філал. н. (1970). З сялян. З сак. 1943 сувязны партыз. атрада «Савецкая Беларусь» брыгады імя Панамарэнкі Брэсцкага злучэння. У ліп. 1944 — крас. 1945 на фронце. Скончыў Гродзенскі пед. ін-т (1952). Настаўнічаў. У 1957—70 навук. супрацоўнік Ін-та л-ры АН БССР. З 1970 заг. кафедры бел. л-ры Гомельскага ун-та. Даследуе нар. вытокі бел. л-ры, асновы бел. вершаскладання, творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Куляшова, П. Глебкі і інш. Сааўтар «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (т. 2, 1966), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969).

Тв.: Максім Багдановіч і народная паэзія, Мн., 1963; Аркадзь Куляшоў, Мн., 1964; Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі, Мн., 1969; Ленінская ідэя народнасці літаратуры і развіццё беларускай паэзіі пачатку XX ст., у кн.: У. І. Ленін і літаратура, Мн., 1970.

Літ.: Лойка А. Максім Багдановіч і народная паэзія, «Полымя», 1963, № 7; яго ж. Вышыня даследавання, там жа, 1969, № 10; Ларченко М. Фольклорные традиции в белорусской поэзии, «Вопросы литературы», 1970, № 10.

Ю. С. Пшыркоў. Мінск.

ГРЫШКІ, вёска ў Лазукоўскім с/с Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., на ўсх. беразе воз. Жарыпскае. Цэнтр калгаса «Чырвоны сцяг». За 17 *км* на ПдУ ад Чашнікаў, 112 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. ст. Вятны. 187 ж., двароў 44 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін.

ГРЫНЬЯР (Grignard) Франсуа Агюст Віктор (6.5.1871 — 12.12.1935), французскі хімік-арганік. Чл. Парыжскай АН (1926). Упершыню атрымаў (разам з Ф. Барб'е) змешаныя магній-галагенарганічныя злучэнні. Дзеяннем іх на розныя рэчывы, якія маюць карбанільную групу (>C=O), сінтэзаваў многія класы арган. рэчываў (рэакцыя Г.). Асн. працы ў галіне металаарганічнага сінтэзу, хіміі атрутных рэчываў, каталітычнага гідравання пры паменшаным ціску. Нобелеўская прэмія 1912.

ГРЫНЯВІЦКІ Ігнат Яўхімавіч (1856, маёнтак Басін Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 1.3.1881), рэвалюцыянер-нарадаволец. З дробнамаянтковых дваран. Студэнтам Пецярбургскага тэхнал. ін-та (1875—80) удзельнічаў у польска-літ.-бел. і рус. рэвалюц. гуртках, вёў прапаганду сярод рабочых, збіраў грошы на літ. вязням, фабрыкаваў пашпарты рэвалюцыянерам. З 1879 чл. партыі «Народная воля». Адзін з заснавальнікаў бел. фракцыі, нац. праграма якой надрукавана ў 1884 у час. «Гомон», № 2. У 1880 з А. І. *Жалябавым*, С. Л. *Пяроўскай* і інш. ўвайшоў у цэнтр. нарадавольскі гурток прапагандыстаў. Адзін з стваральнікаў, аўтараў і наборшчыкаў нарадавольскай «Рабочей газеты», уключыў у выданне газ. земляка А. С. *Барэйшу*. Уваходзіў у групу, якая ўсю зіму 1880/81 сачыла за выездамі цара. 26.2.1881 на кватэры Г. адбыўся сход арганізатараў замаху на Аляксандра II. Адзін з 4 выканаўцаў, якім «Народная воля» даручыла тэрарыст. аперацыю. 1.3.1881 бомбай, кінутай Г., забіты цар Аляксандр II, а Г. смяротна паранены.



Літ.: Деятели революционного движения в России. Биобиблиогр. словарь, т. 3, в. 2, М., 1934; Глинский Б. Б. Революционный период русской истории (1861—1881 гг.), ч. 2, СПб., 1913; Хроника социалистического движения в России. 1878—1887. Официальный отчет, М., 1906.

М. В. Біч. Мінск.

ГРЫП (франц. gripper схопліваць, хапаць), вострая вірусная хвароба чалавека і некаторых жывёл.

У чалавека. Узбуджальнік Г. фільтруюцца вірус трох відаў (A, B, C), блізкіх па структуры і біял. якасцях. Від A мае разнавіднасці A, A_1, A_2 («Ганконг»). Вірусы B і C адрозніваюцца ад віруса A меншай хваробатворнасцю.

Г. бывае праз кожныя 1—3 гады і выклікае эпідэміі (хварэе каля 50% нас.). Хуткаму пашырэнню Г. спрыяюць высокая заражальнасць, кароткі інкубацыйны перыяд (1—2 сутак), сучасны транспарт, сырое і халоднае надвор'е. Пандэміі Г. (ахопліваюць многія краіны або ўвесь свет) бываюць праз 30—40 гадоў (1889, 1918, 1957). Крыніца інфекцыі — хворы на Г. або вірусаносьбіт (рэдка). Перадаецца Г. пераважна паветрана-кропельным шляхам (кашаль, чханне). Вірусы Г. размнажаюцца ў

эпітэліі дыхальных шляхоў, праз 1—2 дні трапляюць у кроў (вірэмія) і пашкоджваюць нервовую і сасудзістую сістэмы і ўнутраныя органы. Г. памяншае імунітэт арганізма да інш. хвароб і актывізуе другасную флору (прычына ўскладненняў). Т-ра цела павышаецца да 39—40 °С, паяўляюцца боль галавы, слабасць, адышамія (рухальныя парушэнні), санлівасць, насмарк, кашаль. Выздараўленне праз 5—6 дзён, але доўга астаецца слабасць, адышамія. Дзеці і старыя хварэюць на Г. больш цяжка. Найб. частыя ўскладненні: запаленні лёгкіх, нырак, атыты, ангіны. Пасля Г. выпрацоўваецца імунітэт на 1—2 гады.

Лячэнне: проціграпозныя гама-глабулін і сываратка, інтэрферон, у цяжкіх выпадках шпіталізацыя хворых. Пры ўскладненнях — антыбіётыкі, фізіятэрапія. Прафілактыка: ізаляцыя хворых, каранцін у дзіцячых установах, вакцынацыя здаровых. У БССР даследаванні па эпідэміялогіі і прафілактыцы Г. вядуцца ў Бел. ін-це эпідэміялогіі і мікрабіялогіі (В. І. Вацякоў, Д. Я. Зібіцкер, Я. М. Селіванаў). Атрыманы гама-глабулін з высокім тытрам антыцелаў.

У жывёл. Хварэюць парасяты, коні, птушкі. Асабліва ўспрымальныя да Г. парасяты да 4 тыдняў. Спрыяюць хваробе дрэнныя гігіенічныя ўмовы. Ускладненні: плеўра-пнеўманерыкардыт, артрыты, у некат. выпадках — менінгіты, атыты, гаймарыты. Гіне 10—15% жывёлы. У коней Г. суправаджаецца гарачкавымі з'явамі, катаральным запаленнем кішэчніка, кан'юнктывітамі. Найб. цяжка хварэюць сысункі. Пры неспрыяльных умовах гадоўлі Г. ускладняецца катаральнай пнеўманіяй, бронхапнеўманіяй, энтэрытамі, ад якіх гіне часам да 25% жывёлы. Меры барацьбы: ізаляцыя хворай жывёлы, дэзінфекцыя памяшканняў, паляпшэнне зоагігіенічных умоў.

Літ.: Вирусные болезни человека, М., 1967; Жданов В. М. и Гайдамович С. Я. Вирусология М., 1966; Грипп и острые респираторные заболевания, ч. 1—2, Л., 1967; Частная эпизоотология, 3 изд., М., 1954; Цион Р. А. и Львов В. М. Болезни молодняка сельскохозяйственных животных, М.—Л., 1963; Вильшанская М. Л., Беляева Н. Р. и Горянина Н. К. (сост.). Грипп. Библиогр. отечественной литературы за 1939—1957 гг., М., 1961; Вильшанская М. Л. и Беляева Н. Р. (сост.). Грипп. Библиогр. отечественной литературы за 1965—1966 годы, М., 1967.

Дз. В. Палешка, В. А. Лянькова. Мінск.

ГРЫЎДА, рака, левы прыток р. Шчары (бас. Нёмана). Даўж. 85 *км*. Цячэ ў Слонімскім і Іванэвіцкім р-нах Гродзенскай і Брэсцкай абл. Вадазбор (1330 км²) раўнінны, месцамі хвалісты, слаба перасечаны. Шыр. даліны 1—1,5 *км*. Гал. прытокі: злева — Була, справа — Бусляж. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 6,3 *м³/сек*. Выкарыстоўваецца як водаприёмнік пры асушэнні балотаў. Каля ракі — г. Іванэвічы.

ГРЫЎДА, вёска ў Бусляжскім с/с Іванэвіцкага р-на Брэсцкай вобл., на р. Грыўда. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 25 *км* на ПнЗ ад Іванэвіч, 146 *км* ад Брэста. 371 ж., дваroў 114 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аддз. сувязі, магазін. Ням.-фаш. захопнікі расстралялі 10 жыхароў вёскі.

ГРЫЎНЯ, 1) вагавая, лічбавая і грашовая адзінкі Старажытнай Русі. На тэр. Беларусі пашыраны 2 віды Г.— заходнеруская, або літоўская (палачка даўж. 10—17 *см*, маса 100—105 *г*, з умяцінамі на «спінцы»), і кіеўская (ромб з усечанымі вострымі вугламі, памер 9—10 на 4—5 *см*, маса 163—164 *г*). Зрэдку трапляюцца наўгародскія Г. (палачка даўж. 14—20 *см*, маса да 204 *г*). Заходнерускія і наўгародскія Г. бытавалі на Беларусі да 15 ст., кіеўскія зніклі ў 13 ст. Г.-злітак былі першымі рублямі, ёсць і палавінныя абрубкі — паўрублі. З 16 ст. Г.— лічбавая грашовая адзінка: 10 капеек або 20 грошаў.

Этымалогія тэрміна звязана з ювелірнымі вырабамі накшталт абруча, што насілі на шыі (гл. *Грыўня шыйная*). Г. як вагавая адзінка серабра да 12 ст. адпавядала 409,512 *г* (фунту), у 12 ст.— 204,756 *г*, да канца 14 ст.— 184 *г*. Як лічбавая адзінка выражалася ў пэўнай колькасці манет (грыўня кун). Спачатку раўнялася 68,22 *г*, у 10—11 ст.— 51,19 *г*, у 12 ст.— 50 *г*. У 2-й пал. 11 — 1-й пал. 12 ст. Русі характэрны т. зв. безманетны перыяд, калі ў абарачэнні былі Г.— буйныя нераменныя зліткі серабра.

2) Рус. сярэбраная манета коштам 10 капеек, упершыню выпушчаная ў 1701. З 1796 на манетах замест «Гр» чаканілі «10 капеек». У канцы 18—19 ст. чаканіліся з медзі. 3) Папулярная назва меднай 3-капеечнай манеты пасля грашовай рэформы 1839—43, калі яе кошт прыраўнялі да дарэформ. 10 капеек.

Літ.: Янин В. Л. Денежно-весовые системы русского средневековья. Домонгольский период, М., 1956; Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970; Рябцевич В. Н. Два монетно-вешевых клада IX в. из Витебской области, у кн.: Нумизматика и эпиграфика, т. 5, М., 1965; Яго ж. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968.

В. И. Рабцэвіч. Мінск.

ГРЫЎНЯ шыйная, упрыгожанне з каштоўных каляровых металаў накшталт абруча, якое насілі на шыі (па-стараславянску — грыва). Г. з золата, упрыгожаныя арнаментам, былі адзнакай улады, іх насілі прадстаўнікі эпаці.

Вядомая ў 2-м тысячагоддзі да н. э., у 5 ст. да н. э. найбольш пашырана ў кельтаў (галаў). У раннім жалезным веку Г. вядомыя і плямёнам, што насялялі тэр. Беларусі, асабліва характэрныя балцкім плямёнам. У Ст. Русі — жаночае ўпрыгожанне, атрыбут знатнага чалавека, правадыра. Большасць Г. 9—13 ст., выяўленых на Беларусі, належыць да балцкага тыпу, верагодна, трапілі праз гандаль. Ёсць і славянскія Г.

Літ.: История культуры древней Руси, т. 1, М.—Л., 1951.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

«ГРЫФ», умоўная назва карнай аперацыі ням.-фаш. акупантаў супраць партызанаў і мірнага насельніцтва ў раёне Віцебск — Орша — Смаленск у жн. 1942. У аперацыі ўдзельнічалі падраздзяленні вермахта і ахоўныя войскі — 3 пях. палкі 286-й ахоўнай дывізіі, 2 батальёны 59-га корпуса, узмоцненыя авіяцыяй, танкамі, артылерыяй. Кіраўнік каманд-зір 286-й ахоўнай дывізіі ген.-м. Рыхерт. У загадзе вызначалася мэта: «уціхамірванне і ачыстка раёна абапал шашы Орша — Віцебск». Асн. сілы партызанаў (брыгады «Аляксея», «Дзядзькі Косці», спец. атрад «Грозны») з баямі выйшлі з-пад удару. Карнікі расстралялі і спалілі 1395 чал.

Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Документы и материалы, т. 1, Мн., 1967, с. 301; Судебный процесс по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими захватчиками в Белорусской ССР, Мн., 1947, с. 42, 55.

У. С. Пасэ, А. А. Фактаровіч. Мінск.

ГРЫФІТ (Griffith) Дэйвід Уорк (22.1.1875, Ла-Грэйндж, штат Кентукі — 23.7.1948), амерыканскі кінарэжысёр. Адзін з заснавальнікаў кіно як мастацтва. З 1908 працаваў на студыі «Баёграф», з 1914 у Галівудзе. Распрацаваў асн. выразныя сродкі кіно — паралельны мантаж, буйны план, а таксама прыёмы акцёрскай ігры. Вядомыя фільмы Г. «Нецярплівасць» (1916) і «Сэрца свету» (1918). Пазней ствараў пераважна кінамеладрамы, найб. значная «Зламаныя парасткі» (1919). У 1922 пачаўся творчы заняпад Г., у 1932 пакінуў кіно. Памёр у Галівудзе ў галечы і невядомасці.

Літ.: Атташева П. и Ахушков Ш. (сост.). Д. У. Гриффит, М., 1944.

ГРЫФОН (франц. griffon), 1) у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве міфалагічная істота з целам ільва, з галавой і крыламі драпежнай птушкі. Як дэкар. матыў вядома Г. склалася ў мастацтве Ст. Усходу, пашырана ў эпоху антычнасці, Рэнесансу і класіцызму. 2) У геалогіі — паглыбленне на зямной паверхні, дзе збіраецца гарачая вада перад вывяржэннем *гейзераў*.



ГРЫФЫ, група птушак атр. драпежных. Каля 20 відаў. Падзяляюць Г. на сапраўдных (14 відаў, пашыраны ў бязлесных гарах і перадгор'ях Афрыкі, Паўд. Еўропы і Азіі) і амерыканскіх. У СССР (на Пд) — *белагаловы сіп, чорны грыф* і *сцярвятнік*.

Даўж. каля 1 *м*, размах крылаў да 3 *м*. Шыя голая або ўкрытая пухам. Лапы масіўныя, пальцы тоўстыя (не могуць схапіць і ўтрымаць здабычы). Жывяцца мярцвячынай.

ГРЫЦАВЕЦ, чыг. ст. на лініі Брэст — Баранавічы і вёска ў Навамышскім с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. За 18 *км* на ПдЗ ад Баранавіч, 191 *км* ад Брэста. 37 ж., гасп. 9 (1971).

ГРЫЦАВЕЦ Сяргей Іванавіч [23.6(6.7).1909, в. Бараўцы Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 16.9.1939], савецкі лётчык, першы двойчы Герой Сав. Саюза (люты, жн. 1939). Чл. КПСС з 1931. Скончыў Арэнбургскую ваен. школу лётчыкаў (1932). З 1927 рабочы Златаустаўскага мех. з-да. Удзельнік вайны ў Іспаніі (1936), дзе збіў 30 фаш. самалётаў, у т. л. 7 за 1 дзень. За выкананне спец. ўрадавага задання ст. л-ту Г. прысвоена званне Героя Сав. Саюза. У 1939 ваяваў на р. Халхін-Гол. Збіў 12 яп. самалётаў. Зрабіў гераічны ўчынак. У час аднаго з баёў загарэўся падбіты самалёт камандзіра злучэння. З парашутам ён выкінуўся і папаў на тэр. ворага. Гэта ўбачыў Г. і прызямліўся побач з камандзірам. Узяў яго ў адно намесны самалёт і на вачах у ворагаў узняўся ў паветра. За адвагу Г. прысвоена другі раз званне Героя Сав. Саюза. З вер. 1939 камандзір знішчальнага авіяпалка. Загінуў у пас. Болбасава каля Оршы. У Мінску і Баранавічах пастаўлены помнікі Г. Яго імем наз. вуліцы ў Маскве, Ленінградзе, Мінску, Оршы, Баранавічах.



Літ.: Люди бессмертного подвига, кн. 1, 2 изд., М., 1965; Дольнікаў А. Подзвіг Сяргея Грыцаўца, «Маладосць», 1960, № 5.

ГРЫЦАН Міхаіл Дзмітрыевіч (н. 11.7.1920, г. Каменскае), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Маскоўскае артыл. вучылішча (1940). У Чырв. Арміі з 1938. У ліп. 1941 удзельнічаў у абароне Мінска. У партызанах з крас. 1942: камандзір атрада ў Клічаўскім і Быхаўскім р-нах, з 1943 камандзір *партызанскага палка 152-га* Магілёўскай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Дырэктар СШ у Днепрапятроўскай вобл.

ГРЫЦКЕВІЧЫ, вёска ў Нясвіжскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Беларусь». За 23 *км* на ПдЗ ад Нясвіжа, 136 *км* ад Мінска, 12 *км* ад чыг. ст. Пагарэльцы. 574 ж., дваroў 200 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ГРЫЦУК Пётр Якаўлевіч (н. 7.7.1927, в. Імянін Драгічынскага пав. Палескага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). З 1951 працуе ў калгасе «Радзіма» Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл., з 1957 жывёлавод.

ГРЫЦЬКІН Канстанцін Данілавіч (1905, с. Ванаўка Чымкенцкага пав. Сырдар'інскай вобл.— 30.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943, тэлефаніст узвода сувязі. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 забяспечыў тэлефоннай сувяззю эскадрон, які першы фарсіраваў Дняпро. 30.9.1944 пры вызваленні в. Галкі знішчыў самаходную гармату. Загінуў у баі за плацдарм.

ГРЫЦЭВІЧЫ, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл., на левым беразе р. Лань. Цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях да камунізма». За 12 *км* на ПдУ ад Клецка, 152 *км* ад Мінска, 14 *км* ад чыг. ст. Клецк, на шашы Слуцк — Брэст. 709 ж., дваroў 232 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 4 магазіны. Помнік на брацкай магіле 27 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГРЫЦЭНКА Сцяпан Іванавіч (н. 10.8.1930, в. Баромля Трасцянецкага р-на б. Сумскай акругі), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1968). Чл. КПСС з 1962. Скончыў Харкаўскі аўтамабільна-дарожны ін-т (1953). У 1953—58 ст. інжынер-тэхнолаг з-да дарожных машын у Жодзіне. З 1958 на Бел. аўтазаводзе, з 1967 нач. аддзела тэхн. кантролю. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні уніфікаваных вялікагрузных аўтамабіляў для адкрытых распрацовак

карысных выкапняў і буд-ва і ў асваенні іх серыйнай вытворчасці.

ГРЫЧЫН, нізінная балота ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл. Утварылася ад забалочвання вялізнага раўніннага паніжэння. Расліннае покрыва асакова-злакава-разнатраўнае, месцамі растуць вольха, бяроза, вярба. Тарфяны пакład не суцэльны. Пл. 32 875 *га*, магутнасць тарфянога пакладу да 2 *м*, сярэдняя 1 *м*, запасы торфу-сырцу 196 млн. $м^3$. Віды торфу пераважна драўняна-багнавыя. Балота часткова выкарыстоўваецца пад сенажаць і выган.

ГРЫЧЫН, балота ў Салігорскім р-не Гомельскай вобл. Прытэрасна-поймавы нізінны масіў. Узнік ад забалочвання сухадолаў. Мае напорнае грунтавое жыўленне, часта заліваецца водамі р. Морачы. Дно балота няроўнае, з гіпнавым торфам у паглыбленнях. Большая ч. балота бязлесная з багатай асакова-злакава-разнатраўнай расліннасцю, паўн. прытэрасная ч. аблесеная. Пл. 12 871 *га*, сярэдняя магутнасць торфу 1,95 *м*, запасы торфу-сырцу 222 млн. $м^3$. Тарфяны пакład з трысняговых, асаковых і драўняна-трысняговых тарфоў. Часткова распрацоўваецца фрэзерным спосабам на ўгнаенне.

ГРЫЧЫНА, вёска ў Фаніпальскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Кастрычніцкая рэвалюцыя». За 18 *км* на ПдУ ад Дзяржынска, 25 *км* ад Мінска, 3 *км* ад чыг. ст. Фаніпаль, 4 *км* ад шашы Мінск — Брэст. 401 ж., двароў 120 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. На брацкай магіле 2 помнікі-абеліскі сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

ГРЫШАЕЎ Віктар Іванавіч [н. 16(29).9. 1909, г. Саратаў], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1946. У Чырв. Арміі з 1931. Полк пад камандаваннем Г. вызначыўся ў чэрв. 1944 у час прарыву абароны ворага, фарсіравання р. Проні, Басі, Расты, Дняпра і 28.6.1944 пры вызваленні Магілёва. Жыве ў Маскве.

ГРЫШАШВІЛІ (Мамулаішвілі) Іосіф Рыгоравіч [12(24).4.1889, Тыфліс — 3.8.1965], грузінскі савецкі паэт і літаратуразнавец. Нар. паэт Груз. ССР (1959). Засл. дз. маст. Арм. ССР (1945). Акад. АН Груз. ССР (1946). Сын муляра. Друкаваўся з 1906. Першыя зб. вершаў «Букет ружаў» (1906) і «Фантазія» (1907). У ранняй творчасці пераважала інтымна-любоўная лірыка. Пасля мерная інтымна-любоўная лірыка. Пасля ўсталявання ў Грузіі Сав. улады ў паэзіі Г. паглыбіліся грамадз. матывы. У Айч. вайну пісаў патрыят. творы, праслякнутыя верай у перамогу («Радзіма і перамога», «Героям Сталінграда»). Найлепшыя вершы Г. пра сацыяліст. пераўтварэнні ў Грузіі («Святло», «Новы Кутаісі», «Узнагарода» і інш.). Аўтар даследаванняў: «Саят-Нава», «Літаратурная багема старога Тбілісі», «Жыццё Аляксандра Чаўчавадзе», «Лермантаў у грузінскай літаратуры» і інш. Перакладаў рус., арм., аверб. і інш. паэтаў. Дзярж. прэмія СССР 1950. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Рус. пер.— Стихи, М., 1957; Лирика, Тбилиси, 1959.

Літ.: Джибладзе Г. Иосиф Гришашвили, Тбилиси, 1958; Хинтибидзе А., И. Гришашвили, Тбилиси, 1959.

ГРЫШКО Валянцін Сяргеевіч (22.3.1922, г. Любомль Уладзімір-Валынскага пав. Валынскай губ.— 26.10.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1942. Вызначыўся 24.6.1944 каля в. Азяраны Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. У час атакі старшына Г. першы ўварваўся ў варожыя траншэі, знішчыў 2 дзоты, кулямёт, замяніў у баі камандзіраў узвода і роты, якія выбылі з строю. Паранены не пакінуў поля бою.

ГРЫШЧАНКА Пётр Лук'янавіч (н. 1.8.1921, в. Кукувячына Віцебскага пав.), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1939). У Чырв. Арміі з 1940. На фронце з сак. 1943 — лётчык-знішчальнік. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызваленні Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, Берлінскай аперацыі. Зрабіў 380 баявых вылетаў, правёў 78 паветр. баёў, збіў 27 варожых самалётаў і аэрастат. Жыве ў Маскве.



ГРЫШЫН Аляксандр Сяргеевіч (н. 28.7. 1920, в. Сцемас Корсунскага пав. Сімбірскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1940. Аддзяленне на чале з ст. сяржантам Г. вызначылася 22.6.1944 у час штурму Сіроціна Віцебскай вобл. 24.6.1944 пад агнём ворага на падручных сродках першы фарсіраваў Зах. Дзвіну, знішчыў агнявыя кропкі праціўніка, гэтым памог пераправе падраздзяленняў. Жыве ў Куйбышаве.

ГРЫШЫН Віктар Васілевіч [н. 5(18).9.1914, Серпухаў], савецкі партыйны, дзяржаўны і прафсаюзны дзеяч. З рабочых. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Маск. геадэзічны тэхнікум (1932), Маск. тэхнікум паравознай гасп. (1937). У 1932—33 тэхнік-землеўпарадчык Серпухаўскага райземаддзела; у 1937—38, 1940 паравозны машыніст, нам. нач. паравознага дэпо чыг. ст. Серпухаў. З крас. 1941 сакратар парткома чыг. вузла ст. Серпухаў. У 1942—50 сакратар, другі сакратар, першы сакратар Серпухаўскага гаркома партыі. У 1950—52 заг. аддзела машынабудавання, у 1952—56 другі сакратар МК КПСС. З сак. 1956 старшыня ВЦСПС. З чэрв. 1967 першы сакратар МГК КПСС. На XIX, XX, XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. З студз. 1961 канд. у чл. Прэзідыума ЦК КПСС, з крас. 1966 канд. у чл. Палітбюро ЦК КПСС, з крас. 1971 чл. Палітбюро ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—8-га скл., чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.



ГРЫШЫН Іван Ціханавіч (16.12.1901, в. Унукавічы Рослаўскага пав. Смаленскай губ.— 20.6.1951). Удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Ген.-палкоўнік. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936). У Чырв. Арміі з 1920. У час Беларускай аперацыі 1944 камандаваў 49-й арміяй 2-га Бел. фронту. Пасля вайны — нач. Цэнтр. ўпраўлення Мін-ва ўзбр. сіл СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 2-га скл.

ГРЭБЕНЕЧАСАЛЬНАЯ МАШЫНА, машына для часання валакністых матэрыялаў (бавоўны, шэрсці, лёну) грабянямі перад прадзеннем. На Г. м. выпрастваюць і паралелізуюць валокны, аддзяляюць кароткія ад доўгіх, ачышчаюць ад раслін. прымесей і вузельчыкаў.

Бываюць Г. м. перыядычнага і бесперапыннага дзеяння. Першыя маюць высокую ачышчальную здольнасць і дакладна аддзяляюць кароткія валокны. Г. м. бесперапыннага дзеяння выкарыстоўваюцца толькі для часання грубай і паўгрубай шэрсці. У тэкст. прамысловасці БССР Г. м. айч. вытворчасці ўстаноўлены на Гродзенскай баваўнапрадзільнай ф-цы і на Баранавіцкім баваўняным камбінаце, Г. м. маркі «Тэкстыма» (ГДР) — на Мінскім камвольным камбінаце.

Літ.: Гончаров А. В. Новое в технике и технологии гребнечесания хлопка, М., 1965; Яго ж. Машины гребнечесального перехода хлопкопрядильного производства, М., 1961.

ГРЭБЛЯ, насыпная дарога цераз нізкія і балоцістыя мясціны; пад насып часта падсцілаюць галлё, вяршаліны дрэў.

ГРЭБЧАНКА Сяргей Сяргеевіч (н. 12.10. 1919, с. Малы Бобрык Ахтырскага пав. Харкаўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1952. Узвод пад камандаваннем лейтэнанта Г. 28.6.1944 на шашы Жлобін — Бабруйск разграміў аўтакалону ворага. У баях каля Баранавіч 7.7.1944 знішчыў штаб варожага палка. 10.7.1944 удзельнічаў у вызваленні Слоніма. Жыве ў Сумах.

ГРЭГАРЫНЫ (Gregarinida), атрад паразітычных прасцейшых класа спаравікоў. Цела чэрвепадобнае, даўж. ад 10 *мкм* да 16 *мм*, укрыта пелікулай (шчыльны слой пратаплазмы). Вядома каля 500 відаў. Г.— паразіты беспазваночных жывёл, пераважна чарвей і членістаногіх (пчол, жукоў).

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.


ГРЭЗА, рака, левы прыток Друці (бас. Дняпра). Даўж. 51 *км*. Цячэ ў Магілёўскім і Быхаўскім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (458 $км^2$) размешчаны на ўсх. ускраіне Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2,3 $м^3/сек$. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

ГРЭЙ (Gray) Джон (1798—1850), англійскі дробнабуржуазны эканаміст, сацыяліст-утапіст. Аўтар прац «Лекцыя пра чалавечае шчасце» (1825), «Сацыяльная сістэма» (1831) і інш., у якіх выкрываў капіталіст. эксплуатацыю. Выступаў за дробную прыватную ўласнасць, засн. на асабістай працы. Вырашэнне сац. праблем бачыў у арганізацыі абмену. Прапанаваў выпусціць т. зв. «рабочыя грошы», з дапамогай якіх праз нац. банк павінен ажыццяўляцца абмен тавараў паводле колькасці затрачанага на іх вытворчасць фактычнага рабочага часу.

Тв.: Рус. пер.— Соч., М., 1955.

Літ.: Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952.

ГРЭЙДЭР (англ. grader, ад grade ніверіраваць), землярыйная дарожна-будаўнічая машына. Рабочы орган Г.— адвал з нажом, якім пры руху Г. зрэзваюць і разраўноўваюць грунт ці сыпкі буд. матэрыял. Адвал з нажом можна падымаць і паварочваць адносна грунту і напрамку руху.



Аўтагрэйдэр.

Падзяляюцца на прычапныя і самаходныя (аўтагрэйдэры, гл. рыс.). Прычапныя Г.: лёгкія (даўж. нажа 2,5—3 *м*; Д-241) і цяжкія (3,5—4,5 *м*; Д-20Б). Аўтагрэйдэры адрозніваюцца па іх масе і па магутнасці рухавіка: лёгкія — 7—9 *т*, 55—67 *кВт* (75—90 к. с.; Д-710, Д-512 і інш.); сярэднія — 10—13 *т*, 74—110 *кВт* (Д-557, Д-559 і інш.); цяжкія — 17—23 *т*, звыш 150 *кВт* (Д-395А, Д-550 і інш.). Для вялікіх аб'ёмаў земляных работ выкарыстоўваюць таксама Г.-элеватары і *струг*і, якія ў адрозненне ад звычайных Г. маюць транспарцёр для перамяшчэння грунту ў транспартную машыну. Г.-элеватары падзяляюць: па спосабе перамяшчэння — на прычапныя (Д-192А), паўпрычапныя (Д-437), навясныя (Д-144Э) і самаходныя (Д-369, Д-505); па размяшчэнні транспарцёра адносна падоўжнай восі Г.— перпендыкулярныя, дыяганальныя і паваротныя; па канструкцыі нажа — на дыскавыя, плужныя і скрабалкавыя. Г. ўжываюць для прафілявання дарог, планіроўкі адхонаў і інш.

Літ.: Хархута Н. Я. и др. Дорожные машины, Л., 1968; Домбровский Н. Г. и Гальперин М. И. Землеройно-транспортные машины, М., 1965. *І. І. Леановіч.* Мінск.

ГРЭЙЗЕН (ням. Greisen расшчапленне), горная парода, складзеная з кварцу і светлых слюдаў (звычайна з лепідаліту і мускавіту).

У саставе Г. нярэдка бываюць топаз, флюарыт, турмалін і ўкрапанікі каштоўных рудных мінералаў (касітэрыту, вальфраміту, танталіту, радзей малібдэніту, мінералы мыш'яку, вісмуту і іншых радзей медзі), якія часам утвараюць скопішчы ў прамысловых колькасцях (рудныя радовішчы). Трапляюцца ў краявых частках гранітных масіваў, часта каля рудных жылаў. Утвараюцца ў выніку пнеўматалітава-гідратэрмальнай змены саставу парод — грэйзенізацыі.

Літ.: Щерба Г. Н. Грейзеновые месторождения, у кн.: Генезис эндогенных рудных месторождений, М., 1968.

ГРЭЙМАН Аляксандр Абрамавіч [25.6(7.7). 1899, г. Казань — 1.6.1970], беларускі савец-

кі вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1961), праф. (1963). Чл. КПСС з 1943. Скончыў мед. ф-т БДУ ў 1926. У 1926—31 працаваў урачом у Мінскай вобл. Ардынатар, асістэнт факультэцкай хірург. клінікі Мінскага мед. ін-та (1931—38). У 1939—45 гал. хірург групы ваен. шпіталяў Сав. Арміі; у 1946—62 асістэнт і дацэнт кафедры шпітальнай і агульнай хірургіі Мінскага мед. ін-та. З 1963 заг. кафедры шпітальнай хірургіі Мінскага мед. ін-та. Асн. працы па хірургіі валляка, эндакрыннай сістэмы і органаў брушной поласці. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі. Сааўтар кнігі «Актуальныя пытанні вострага апендыцыту».

Тв.: Хирургическое лечение и патоморфология зоба. Мн., 1964.

ГРЭЙФЕР (ням. Greifer, ад greifen схапіць), самазачэрпны грузазахопны механізм. Гл. *Грузазахопныя прыстасаванні.*

ГРЭКА-БАКТРЫЙСКАЕ ЦАРСТВА, рабаўладальніцкая дзяржава на тэр. Сярэдняй Азіі, Афганістана, Пакістана і паўн.-зах. Індыі (каля 250—130 да н. э.). Узнікла ў выніку адасаблення сярэднеазіяцкіх тэр. ад *Селеўкідскай дзяржавы.*

Г.-Б. ц. дасягнула магутнасці пры царах Еўтыдэме [каля 230—200 да н. э.] і яго сыне Дэметрыі. У 190—180 да н. э. ў царства ўключаны Арэя (Арыя) і Арахасія (Герацкая і Кандагарская вобл. Афганістана), Дрангіяна (Усх. Іран), Парапамісады (Паўд. Гіндукуш) і паўн.-зах. Індыя. Найб. гарады: Бактра (Балх), Антыёхія-Маргіяна (Мары), Дэметрыяс (Тэрмез), Мараканда (Самарканд), Каписа (Беграм). Аслабленае вызв. рухам і набегамі вандроўных плямёнаў каля 175 да н. э. Г.-Б. ц. распалася на Грэка-Бактрыйскае і Грэка-Індыйскае царствы, а паміж 140—130 да н. э. перастала існаваць. Археал. даследаванні сведчаць пра высокую культуру Г.-Б. ц., якая склалася ў выніку ўзаемаабагачэння мясцовых, усх. эліністычных, індыйскіх і іранскіх элементаў.

Літ.: История Узбекской ССР, т. 1, Ташкент, 1967; Росляков А. А. Краткий очерк истории Туркменистана, Ашхабад, 1956; Тревер К. В. Памятники греко-бактрийского искусства, М.— Л., 1940.

В. І. Гарамыкіна. Мінск.

ГРЭКАВА Надзея Рыгораўна [н. 4(17).9.1910, Мінск], парт. і дзярж. дзеячка БССР. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1932. Скончыла Вышэйшую школу партарганізатараў пры ЦК ВКП(б) (1941). З 1922 на швейнай ф-цы «Кастрычнік», з 1933 да 1937 на прафс. рабоце. У 1937—38 заг. аддзела ЦК КП(б)Б, у 1938—40 сакратар ЦК КП(б)Б. У 1938—47 Старшыня Вярх. Савета БССР. У Айч. вайну сакратар Казанскага гаркома партыі. У 1943—46 нам. Старшыні СНК БССР. У 1947—49 міністр харч. прамысловасці БССР, 1949—52 нам. міністра харч. прамысловасці РСФСР. Чл. Бюро ЦК КП(б)Б у 1938—40, чл. Цэнтральнай рэвізійнай камісіі ЦК ВКП(б) у 1939—52. Дэп. Вярх. Савета СССР 2-га скл., Вярх. Савета БССР 1-га скл., Вярх. Савета РСФСР 3-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Маскве.

ГРЭКА-ПЕРСІДСКІЯ ВОЙНЫ 500—449 да н. э., войны паміж Персіяй і старажытнагрэчаскімі полісамі (гарадамі-дзяржавамі) Балканскага паўвострава. Гал. прычына войнаў — захопніцкая палітыка Персіі (гл. *Ахеменідаў дзяржава*) у басейне ўсх. ч. Міжземнага мора.

Першы паход персаў у Грэцыю пад каманд. Мардонія вясной 492 да н. э. быў ніўдалы: флот разбіла бура, а сухап. армію перамаглі фракійцы. У час 2-га паходу персы высадзіліся на ўсх. узбярэжжы Атыкі. 13.9.490 да н. э. аб'яднаныя сілы афінян і платэйцаў пад каманд. афінскага стратэга Мільтыяда ў славутай *Марафонскай бітве* адстаялі незалежнасць усёй Грэцыі. Грэч. гарады, якія раней прызналі ўладу персаў, абвясцілі сябе зноў незалежнымі. У 480 перс. цар Ксеркс на чале сухап. арміі і ў суправаджэнні флоту ўварваўся ў Грэцыю з Пн. Ксеркс прайшоў Паўн. і Сярэднюю Грэцыю, пад Фермапіламі разбіў атрад спартанскага цара Леаніда і захапіў Афіны. Аднак 28.9.480 да н. э. грэкі перамаглі перс. флот каля в-ва Саламіна. Ксеркс з часткай арміі вярнуўся ў М. Азію. У 479 да н. э. аб'яднаная грэч. армія разграміла ў Беотыі перс. армію Мардонія. Пасля перамогі на моры каля мыса Мікале (479 да н. э.) ініцыятыву захапілі грэкі. Перс. флот спрабаваў спыніць нашэсце грэкаў, але быў разбіты ў вусці р. Эўрымедонт у 469 да н. э. Апошняе паражэнне персы панесці ў 449 да н. э. каля кіпрскага г. Саламіна. Пасля гэтага быў заключаны т. зв. Каліеў мір, паводле якога перс. цар адмаўляўся ад гегемоніі ў Эгейскім м., грэч. гарадах М. Азіі, на шляхах у Прычарнамор'е.


Гал. прычына перамогі грэкаў на першым этапе — вызваленчы характар вайны. Перс. наёмная армія была мала зацікаўлена ў перамозе. Вял. значэнне мела і перавага грэч. узбр. сіл, асабліва марскога флоту, і ваен. тактыкі, што было вынікам больш высокага ўзроўню сац.-эканам. развіцця грэч. полісаў у 5 ст. да н. э. Перамога грэкаў дала ім новыя гандл. шляхі, новыя рынкі, паскорыла развіццё рабаўладальніцкага спосабу вытворчасці.

Кр.: Геродот. История в девяти книгах, пер. с греч., т. 1—2, 2 изд., М., 1888.

Літ.: Древняя Греция, М., 1956; Сергеев В. С. История Древней Греции, 3 изд., М., 1963.

Р. А. Нікольская. Мінск.

ГРЭКАЎ Барыс Дзмітрыевіч [9(21).4.1882, Міргарад — 9.9.1953], савецкі гісторык. Акад. АН СССР (1935, чл.-кар. 1934), чл. Акад. архітэктуры СССР (1939), з 1946 чл. Польскай і Балгарскай АН, з 1947 ганаровы чл. АН БССР. Скончыў Маскоўскі ун-т (1907). З 1910 выкладаў у ВНУ Пецярбурга, Пермі, Сімферопаля, Масквы. У 1937—53 дырэктар Ін-та гісторыі АН СССР. Даследаваў гісторыю феад. адносін у Расіі, гісторыю слав. народаў; вывучаў археаграфію і крыніцазнаўства. З марксісцка-ленінскіх пазіцый адхіліў «манархічную» тэорыю паходжання Русі і даказаў, што Кіеўская Русь была, насуперак нацыяналіст. тэорыі М. С. Грушэўскага, радзімай рус., укр. і бел. народаў. Асн. працы Г.: «Кіеўская Русь» (3 выд., 1939), «Культура Кіеўскай Русі» (1944), «Сялянне на Русі з найстаражытнейшых часоў да 17 ст.» (1946), (разам з А. Ю. Якубоўскім) «Залатая арда і яе падзенне» (1950). Дэп. Вярх. Савета СССР 3-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1952.



Тв.: Избр. труды, т. 1—4, М., 1957—60.

Літ.: Б. Д. Греков, М.—Л., 1947 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР); Шунков В. И., Б. Д. Греков (Творческий путь), у кн.: Академику Б. Д. Грекову ко дню семидесятилетия, М., 1952 (бібліягр. прац Г.); Валк С. Н., Б. Д. Греков как деятель археографии, у кн.: Археографический ежегодник за 1958 г., М., 1960; Устюгов Н. В. Деятельность академика Б. Д. Грекова в области издания исторических источников, у кн.: Археографический ежегодник за 1959 г., М., 1960.

М. Я. Стральцоў. Мінск.

ГРЭКАЎ Мітрафан Барысавіч [да 1911 — Мартышчанка Мітрафан Паўлавіч; 3(15).6.1882, хутар Шарпаеўка Вобласці Войска Данскога — 27.11.1934], рускі савецкі мастак. Заснавальнік сав. батальнага жывапісу. Вучыўся ў Адэскім маст. вучылішчы (1899—1903) і Пецярбургскай АМ (1903—11) у І. Рэпіна і Ф. Рубо. Член АМРР (1925). Удзельнік грамадз. вайны. Асн. тэма твораў Г.— гераізм народа, рэвалюц. рамантыка яго баявых будняў: «У атрад да Будзённага» (1923), «Чырвоны сцяг у Сальскім стэпе» (1924), «Тачанка» (1925), «Бой пад Егарлыкскай» (1928—29), «Трубачы Першай коннай арміі» (1934) і інш. Аўтар панарамы «Абарона Царыцына» (1933). Імем Г. названа створаная ў 1935 у Маскве Студыя ваен. мастакоў. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Батальны жанр.*




Літ.: Халаминский Ю. Митрофан Борисович Греков, М., 1956; Тимошин Г. А. Митрофан Борисович Греков, М., 1961; М. Б. Греков в воспоминаниях современников, Л., 1966.

ГРЭНЛА́НДСКАЕ МО́РА, ускраінае мора Паўн. Ледавітага ак., паміж а-вамі Грэнландыя, Шпіцберген, Мядзведжы, Ян-Маен, Ісландыя. Пл. 1205 тыс. км². Глыб. да 3830 м. У зах. ч. ўвесь год плаваюць ільды, ва ўсх.— праходзіць цёплае Шпіцбергенскае цячэнне, адгалінаванне Гальфстрыма. Сярэдняя т-ра вады на паверхні зімой на Пн —1, на Пд і ПдУ 1—2 °С; летам на ПнЗ ніжэй за 0, на Пд і У 5—6 °С. Салёнасць 32—35‰. Прылівы паўсутачныя, выш. да 4,4 м. Здабыча кітоў і грэнландскіх цюленяў.

ГРЭНЛА́НДСКІ АНТЫЦЫКЛО́Н, вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая размяшчаецца ўвесь год над большай часткай Грэнландыі, а зімою — над усім востравам. Значныя памеры Грэнландыі, якая ляжыць у высокіх шыротах, вялікая вышыня над узр. м. і высокі атм. ціск (да 1016 *мб*) садзейнічаюць фарміраванню арктычнага паветра кантынентальнага паходжання і асабліва суровага клімату. У абласцях высокага ціску т-ра паветра ў студз. да —46 °С, абс. мінімум у цэнтры в-ва да —70 °С. Летнія т-ры каля —12 °С.

ГРЭНЛА́НДСКІ КІТ, млекакормячая жывёла падатрада *бяззубых кітоў.*

ГРЭНЛА́НДЫЯ (Grønland), найбольшы ў свеце в-аў у Паўн. Ледавітым і Атлантычным акіянах, уваходзіць у склад Даніі. Пл. 2,2 млн. км². Нас. каля 47 тыс. чал. (1969), больш за 90% эскімосы, астатнія датчане. Адм. ц. і порт Готхаб.



Берагавая лінія моцна парэзана фіёрдамі. Больш за 75% тэр. занята ледавіковым шчытом; таўшчыня лёду да 3400 м. Паверхня ледавіка ўкрыта слоем снегу, ніжэй за 2000—1800 м над узр. м. слаба парэзаная воднымі патокамі, якія іншы раз узнікаюць летам. Ледавікі спаўзаюць у акіян са скорасцю 20—40 м за суткі і кожны год даюць 13—15 тыс. айсбергаў. На не занятай лёдам тэр. горы выш. да 3700 м (г. Гунб'ёрн), складзеныя пераважна з крышталічных парод. Карысныя выкапні: крыяліт, буры і каменны вугаль, нафта, свінец, цынк, уран, малібдэн, берылій, хром, серабро. Клімат узбярэжжаў Г. марскі, субарктычны (на Пд ад 68° паўн. ш.) і арктычны; ва ўнутраных раёнах кантынентальны арктычны. Сярэдняя т-ра студз. на ўзбярэжжы ад —7 на Пд да —36 °С на Пн, ліп. ад 10 на Пд да 3 °С на ПнЗ. У цэнтры Г. сярэдняя т-ра студз. —46 (абс. мінімум —70 °С), ліп. —12 °С. Ападкаў за год на Пд 800—1100 *мм*, на Пн 150—250 *мм*, на ледавіку 300—400 *мм*. Дзьмуць моцныя вятры. Не ўкрытыя лёдам тэр. заняты тундрай: на Пд хмызняковая (карлікавая бяроза, вярба, вольха, рабіна), на Пн — мохава-лішайнікавая і арктычныя пустыні. На берагах Г. водзяцца паўн. алені, белыя мядзведзі, палярныя ваўкі, пясцы, палярныя зайцы, лемінгі, на Пн аўцабык. З птушак — гагі, чайкі, белыя курапаткі, совы, арлы і інш. Мора багатае на рыбу (траска, палтус, мойва), ёсць цюлені, маржы.

Г. адкрыта нарманамі каля 875. З 10 да 15 ст. на берагах існавалі калоніі нарманаў. У 1721 пасяліліся місіянеры з Даніі. З 1774 гандаль з Г. стаў манаполіяй дацкага ўрада. У 1921 Данія заявіла пра свой суверэнітэт над в-ам, у 1924 аб'явіла сваёй калоніяй. Па канстытуцыі 1953 Г. аб'яўлена часткай Даніі. З часу 2-й сусв. вайны на в-ве вялікія ваен. базы ЗША.

Асн. занятак насельніцтва — лоўля рыбы, паляванне і марскі звераробайны промысел. Штогод нарыхтоўваюць 90 тыс. шкурак марскога звера, 4 тыс. пясца. Гадоўля авечак і аленяў. Здабыча крыяліту (адно з найбольшых у свеце радовішчаў каля Івігтута), бурага вугалю на в-ве Дыска, свінцу і цынку на беразе заліва Скорсбі. Гандл. сувязі пераважна з Даніяй і ЗША.

ГРЭНСК, стаянка фінальнага палеаліту (13—8 тыс. гадоў назад) ва ўрочышчы Грэнск каля Чачэрска Гомельскай вобл. Размешчана на 1-й надпоймавай тэрасе Сажа. Даследавалі К. М. Палікарповіч і У. Дз. Будзько. Выяўлены ніжні і верхні культурныя пласты, знойдзены крамянёвыя прылады працы і зброя (наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, праколкі, нажападобныя пласціны тыпу сцізорыка). Стаянкі тыпу Г. адносяць да субарктычнага часу (мадленскі перыяд у Францыі, мазаўшанскі цыкл у Польшчы) і ў літаратуры аб'ядноўваюць пад назвай помнікаў грэнскай культуры.

Літ.: Будько В. Д. и Вознячук Л. Н. Палеолит Белоруссии и смежных территорий, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1969.

ГРЭСК, вёска (раённы цэнтр у 1924—56) у Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Гігант». За 18 *км* па Пн ад Слуцка, 90 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Слуцк, 4 *км* ад шашы Слуцк — Мінск. 2192 ж., гасп. 617 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, сепаратарны пункт, пякарня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, кінатэатр, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, паліклініка, аптэка, дом інвалідаў, аддз. сувязі, 2 сталовыя, 8 магазінаў. У 16 ст. належала кн. Радзівілам, атрымала права мястэчка. Ням.-фаш. захопнікі спалілі 137 двароў, расстралялі 142 мірных жыхароў. На Кургане Славы помнік сав. воінам, партызанам і жыхарам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГРЭТРЫ (Grétry) Андрэ Эрнест Мадэст (11.2.1741, Льеж — 24.9.1813), французскі кампазітар. Па паходжанні бельгіец. Чл. Ін-та Францыі (1795). З 1767 жыў у Парыжы, стаў самым папулярным майстрам франц. камічнай оперы. Надаў ёй сац. праблематыку, расшырыў дыяпазон ідэйна-вобразнага зместу, узмацніў псіхал. выразнасць. Напісаў больш за 60 опер; адна з найб. вядомых — «Рычард Ільвінае Сэрца» (1784). Г. належаць першыя рэвалюц. оперы (нар.-патрыят. «Вільгельм Тэль», 1791; опера-апафеоз «Рэспубліканская выбранніца, ці Трыумф дабрадзейнасці», 1794, і інш.). Напісаў «Мемуары» — яркі дакумент муз. эстэтыкі 18 ст.

Літ. тв.: Рус. пер.— Мемуары, или Очерки о музыке, т. 1, М.— Л., 1939.

ГРЭЦКАЕ, возера ў бас. р. Волты, левага прытока Зах. Дзвіны, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,83 *км*². Даўж. 4 *км*, найб. шыр. 0,25 *км*, сярэдняя 0,21 *км*. Катлавіна выцягнута з ПдЗ на ПнУ. Вадазбор (16,2 *км*²) нізінны. Возера праточнае, злучана пратокамі з Волтай і воз. Чэрас. Водзяцца шчупак, акунь, плотка, верхаводка, карась, лешч.

ГРЭЦКІ Іван Мікалаевіч (1898, мяст. Косава Гродзенскай губ.— 1937), удзельнік рэвалюц. і нац.-вызв. руху ў Зах. Беларусі. З сялян. У 1924—27 сакратар падпольнага райкома КПЗБ. У 1927 арыштаваны і пасаджаны ў турму. 4.3.1928 завочна выбраны дэпутатам польскага сейма і ў маі 1928 як дэпутат вызвалены з турмы. Чл. Беларускай дэпутацкай фракцыі барацьбы за інтарэсы сялян і рабочых *«Змаганне»*. Адзін з кіраўнікоў рэвалюц.-вызв. арг-цыі «Змаганне». 30.8.1930 арыштаваны польскімі ўладамі і зняволены на 8 гадоў. У выніку абмену паліт. вязнямі паміж СССР і Польшчай з 1932 у Мінску.

У. А. Полуян. Мінск.

ГРЭЦЫЯ Старажытная (Элада), група рабаўладальніцкіх дзяржаў на Пд Балканскага п-ва, а-вах Эгейскага м., узбярэжжы Фракіі і зах. берагавой паласе Малой Азіі з калоніямі ў Паўд. Італіі і Усх. Сіцыліі, Паўд. Францыі, на паўн. узбярэжжы Афрыкі, узбярэжжы Чорнага м. і чарнаморскіх праліваў; у 2—1 ст. да н. э. ўвайшлі ў склад Рымскай дзяржавы. Была краінай «найбольш высокага «гістарычнага развіцця» сярод народаў старажытнага свету» (Маркс К. Перадовіца в № 179 «Kölnische Zeitung», Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 1, с. 98).


Гісторыю Г., паводле традыцыі, падзяляюць на 5 перыядаў: крыта-мікенскі, гамераўскі, архаічны, класічны, эліністычны. Крыта-мікенскі перыяд — 3—2-е тысячагоддзі да н. э. Раскопкі англ. археолага А. Эванса выявілі рэшткі стараж. абудаванняў на в-ве Крыт, культура якога папярэднічала культуры мацерыковай Г. (гл. *Крыта-мікенская культура*). Знойдзены прылады працы, вырабы з медзі, серабра, волата. Па аналогіі з перыядызацыяй Крыта гісторыю балканскай Г. гэтых часоў падзяляюць яшчэ на 3 перыяды. Раннеэладскі (каля 2800—2000) — перыяд халкаліту і першабытнаабшчыннага ладу. Сярэднеэладскі (каля 2000—1500) — час бронзавай тэхнікі, якую прынеслі грэч. плямёны з Пн Балканскага п-ва (ахейцы, магчыма, іанійцы). Ранейшыя жыхары Г., пеласгі, былі выцеснены, паселішчы іх разбураны. Узнікаюць раннерабаўладальніцкія дзяржавы Мікены, Тырынф, Пілас. У познаэладскі перыяд (каля 1500—1200) ахейцы заваявалі ўвесь Крыт, Трою, астравы, якія раней належалі Крыту, гандлявалі з многімі краінамі Міжземнамор'я. Гамераўскі перыяд Г.— каля 1200—800 да н. э. Каля 1200 да н. э. грэч. плямёны дарыйцаў з Пн перайшлі ў паўд. частку Балканскага п-ва, на в-аў Крыт, некат. а-вы Эгейскага м. Адначасова з дарыйцамі ў паўн. раёнах Г. паляўляюцца ілірыйцы, на ўзбярэжжы Эгейскага м. фракійцы. Пад уплывам заваёўнікаў распаліся ахейскія дзяржавы, ажывіліся родавыя адносіны. Узніклі дробныя самаст. абшчыны. Апрацоўка жалеза спрыяла далейшаму развіццю прадукцыйнасці працы. Узнікла алфавітнае пісьмо, у 9—8 ст. да н. э. ім быў запісаны гамераўскі эпас. Перыяд архаічнай Г.— 800—500 да н. э.— час утварэння полісаў (гарадоў-дзяржаў). Ужыванне жалеза ўдасканаліла рамесную вытворчасць, якая паступова аддзяляецца ад земляробства. Прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці павялічыла маёмасную няроўнасць. Грэч. гандаль набыў міжнар. характар, вырасла значэнне рабства. Палўленне новай, рабаўладальніцкай знаці, збяднение дробных свабодных землеўладальнікаў, імкненне родавай знаці захаваць паліт. ўладу выклікалі вострую класавую барацьбу, у выніку якой на змену остаганам грамадскай улады родавага ладу прыходзіць дзяржава. Класічным прыкладам т. зв. сінайкізму (аб'яднання некалькіх родавых абшчын), які прывёў да ўтварэння полісаў, з'яўляецца Афінскі поліс. Пераход да рабаўладальніцкага ладу ў Г. адбыўся ў 8—7 ст. да н. э. Найб. поўнае развіццё рабаўладальніцкія адносіны атрымалі ў Афінах, Спарце, Фівах, Корынфе, Сіракузах, Мілеце, Эфесе, Самасе, Родасе, Пергаме, Александрыі Егіпецкай і інш. гарадах-дзяржавах. Рабы выкарыстоўваліся ў земляробстве, рамяством, на рудніках, у гандлі, на будаўніцтве, у сям'і. Рабаўладальніцкая эканоміка Г. дасягнула росквіту ў 5—4 ст. да н. э. Развіваюцца таварна-грашовыя адносіны, ажыццяўляецца чаканка манет, з'яўляюцца банкі, вялікія гандл. і ліхвярскія капіталы. Сярод рамёстваў вылучаюцца керамічнае, ювелірнае, ткацкае, металургічнае, суднабудаўнічае. Развіваюцца навука, літаратура, мастацтва. Пасля Пелапанескай вайны 431—404 да н. э. паміж Афінамі і Спартай, якая скончылася перамогай Спарты, пачынаецца заняпад Г. Ён выявіўся ў ліквідацыі эканам. і паліт. самастойнасці гарадоў-дзяржаў, у ўмацаванні ролі Спарты, Фіваў, Афін, Македоніі, у ўзмацненні эксплуатацыі рабоў, у абмежаванні дэмакратыі, у ўзмацненні барацьбы паміж рабаўладальнікамі і рабамі. Гэта прывяло да ўмацавання Македоніі, якая ў 338 да н. э. падпарадкавала Г. Пасля смерці Аляксандра Македонскага (323 да н. э.) Г. ўвайшла ў склад яго дзяржавы, пасля распаду якой (3 ст. да н. э.) Г. была падзелена паміж дынастыямі Лагідаў, Селеўкідаў і Атталідаў. Пасля заваявання Г. Рымам (2—1 ст. да н. э.) яе гісторыя ўвайшла ў гісторыю Рымскай дзяржавы.




1



2




3




4

Грэцыя Старажытная I.

1. Храм Апалона ў Карынфе. Каля 550 да н. э.
2. Іктын і Калікрат. Парфенон. Афінскі Акропаль. 447—438 да н. э.
3. Эрэхтэён. Порцік карыятыд. Афінскі Акропаль. 421—406 да н. э.
4. Храм Пасейдона на мысе Суніян. 3-я чвэрць 5 ст. да н. э.
5. Феодар з Факеі. Фолас у Дэльфах. Пачатак 4 ст. да н. э.
6. Паліклет Малодшы. Тэатр у Эпідаўры. 350—330 да н. э.



5



6







Грэцыя Старажытная II. 1. Кора «675» з Афінскага Акропаля. Каля 510 да н. э. 2. Крытый і Несіёт. Гармодый і Арыстагітан. 477 да н. э. 3. Міран. Дыскабол. Сярэдзіна 5 ст. да н. э. 4. Коннікі. Фрагмент фрыза Парфенона. 447—432 да н. э. 5. Круг Фідыя. Мойры. Фрагмент скульптуры ўсходняга франтона Парфенона. Афінскі Акропаль. 438—432 да н. э. 6. Паліклет. Дарыфор. Каля 440 да н. э. 7. Праксіцель. Гермес з дзіцем Дыянісам. Фрагмент. Каля 340 да н. э. 8. Ніка Самафракійская. Канец 4 ці 2 ст. да н. э.





пісваюць легендарнаму цару Тэсею, было ўзнікненне горада-дзяржавы *Афінаў* Старажытных. Рабская праца ў вытворчасці выцесніла працу свабоднай беднаты. Абеззямеленаму насельніцтву патрэбны былі новыя тэрыторыі. Гэта стала прычынаю ўтварэння калоній (гл. *Калоніі антычныя*). Паміж полісамі ішла барацьба за землі, марскія шляхі, што вяло да пастаянных войнаў. У 6 ст. створаны саюз гарадоў-дзяржаў на чале са *Спартай — Пелапанескі саюз*. Класічны перыяд (5—4 ст. да н. э.) — час эканам., паліт. і культ. росквіту Г. Узмацніліся гандл.-рамесныя полісы Карынф, Мегара (Мегары), Візантый, Афіны, якія ўзначалілі барацьбу грэкаў у *грэка-персідскіх войнах* 500—449 да н. э. У барацьбе з персамі ўзнік Афінскі марскі саюз, які пазней ператварыўся ў *Архе Афінскую*. Стараж.-грэч. культура асабліва расквітнела пры *Перыкле*. Супярэчнасці паміж грэч. дзяржавамі былі прычынай *Пелапанескай вайны* 431—404 да н. э. У выніку яе гегемонія ў Г. перайшла да Спарты, якая імкнулася да ўсталявання алігархічнага ладу ва ўсіх полісах. Грэч. гарады значна аслаблі ў выніку вайны. У полісах ішла вострая барацьба дэмакр. і алігархічных тэндэнцый. Сац. і эканам. крызіс поліса абвастрыў барацьбу за гегемонію ў Г. і прывёў да *Карынфскай вайны* 395—387 да н. э. У 378—377 узнік 2-і Афінскі марскі саюз. У 2-й пал. 4 ст. пачалося ўзвышэнне *Македоніі*. У час праўлення *Філіпа II* яна стала моцнай цэнтралізаванай дзяржавай і пачала пагражаць незалежнасці грэч. дзяржаў. Алігархі Г. шукалі ў арыстакратычнай Македоніі падтрымку сваіх класавых інтарэсаў, дэмакр. элементы абаранялі палітычную незалежнасць. У бітве пры Херанеі (338 да н. э.) аб'яднаныя сілы грэч. гарадоў былі пераможаны. Перыяд эліністычны (канец 4—2 ст. да н. э., гл. *Эліністычны*) пачаўся з завалявання Аляксандра Македонскага 334—323 да н. э. Супраць Македоніі і паміж сабою за гегемонію ў Г. змагаліся *Ахейскі саюз* і *Этолійскі саюз*. Спарта ў 3 ст. перажывала заняпад ваен. магутнасці ў сувязі з рэзкай сац. дыферэнцыяцыяй. Спробы спартанскіх цароў Агіса IV [245—241 да н. э.], Клеамена III [235—222 ці 221 да н. э.], тырана (правіцеля) Набіса [206—192 да н. э.] ажыццявіць дэмакр. рэформы сустрэлі супраціўленне арыстакр. Ахейскага саюза, які разам з Македоніяй, а потым з Рымам ліквідаваў рэформы і падначаліў Спарту. Перамога Рыма над Македоніяй паскорыла яго вайну з Ахейскім саюзам, якая скончылася паражэннем грэкаў у 146 да н. э. У 86 да н. э. рымляне захапілі і разрабавалі Афіны, у 27 да н. э. ператварылі Г. ў рымскую правінцыю Ахаю.

Філасофія. Узнікла ў Г. на мяжы 7—6 ст. да н. э. Яе фарміраванне адбывалася ва ўмовах вострай барацьбы паміж рабаўладальніцкай арыстакратыяй і дэмакратыяй. Філас. думка яшчэ не вылучылася з агульнай сумы першапачатковых ведаў, філосафы былі адначасова даследчыкамі прыроды, займаліся праблемамі матэматыкі, фізікі, астраноміі, філалогіі, тэорыі мастацтва, актыўна ўдзельнічалі ў паліт. жыцці сваіх полісаў.

Зыходным пунктам развіцця філасофіі Г. быў матэрыялізм мысліцеляў *мілецкай школы* (6 ст. да н. э.), якія лічылі, што ўсе рэчы маюць адзіны матэрыяльны пачатак: вада ў *Фалеса*, паветра ў *Анаксімена*, апейрон у *Анаксімандра*. Ранняя матэрыялістычная гіпотэза вынікала з улічэння пра ўсеагульную зменлівасць усіх рэчаў, здольнасць аднаго рабіцца другім, пераходзіць у другое, г. зн. уключалі дыялектыку. Ідэя развіцця з'яў атрымала найб. яркае ўвасабленне ў выказваннях *Геракліта* (6—5 ст. да н. э.). Развіццё матэрыялізму ў 5—4 ст. да н. э. звязана з імёнамі Эмпедокла і *Анаксагора*, Левкіпа і *Дэмакрыта* (апошнія вядомы вучэннем атамістычнага матэрыялізму). Разам з матэрыялізмам у філасофіі Г. фарміруецца ідэалізм. Яго пачаткі: у філасофіі элеатаў (Ксенафан, Парменід, Зянон, Мелісс), якія вучылі пра вечнае, нязменнае і нерухомае быццё; у паняцці піфагарэйцаў пра лік як першаасноў рэчаў, пра перасяленне душ; у рэлятывізме сафістаў (Пратагор, Горгій). Як філас. кірунак ідэалізм склаўся ў 5—4 ст. да н. э. ў філасофіі *Сакрата* і асабліва *Платона*, які свядома і непрымірыма проціпаставіў сваю філасофію матэрыялізму. З таго часу ў грэчаскай філасофіі ідзе барацьба паміж матэрыялізмам і ідэалізмам, выяўляюцца, паводле слоў У. І. Леніна, дзве лініі ў філасофіі — «лінія Дэмакрыта» і «лінія Платона» (гл. Тв., т. 14, с. 117). Сістэматызацыю тагачасных філасофскіх і навуковых ведаў ажыццявіў *Арыстоцель* (4 ст. да н. э.), які завяршыў развіццё філасофіі Г. ў перыяд полісаў. Філасофіі Арыстоцеля характэрныя ваганні паміж матэрыялізмам і ідэалізмам. У той жа час Арыстоцель нанёс сур'ёзны ўдар не толькі містычнай філасофіі Платона, але і ўскраму ідэалізму, правільна сцвярджаючы, што матэрыяльны свет не ёсць «цень ідэй», а існуе сам па сабе і з'яўляецца крыніцай ідэй, паняццяў, пачуццяў і інш. «Крытыка Арыстоцелем «ідэй» Платона ёсць крытыка ідэалізму, як ідэалізму наогул...» (Ленін У. І. Тв., т. 38, с. 272). Гал. філас. плыні перыяду эліністычнага: *скептыцызм*, эпікурэізм і *стаіцызм*. У той час як матэрыялістычная лінія Дэмакрыта праводзілася *Эпікурам* (4—3 ст. да н. э.) і перадавымі александрыйскімі вучонымі, ідэалістычная філасофія рабілася ўсё больш рэакцыйнай і адкрыта злучалася з рэлігіяй. Разлажэнне і поўны заняпад рабаўладальніцкай ідэалогіі адбіліся на містыцызме неапіфагарэйцаў і неаплатонікаў, у агностыцызме скептыкаў, у глыбокім песімізме стоікаў. «...У многастайных формах грэчаскай філасофіі ўжо ёсць у зародку, у працэсе ўзнікнення, амаль усе павнейшыя тыпы светапоглядаў» (Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954, с. 25). Філасофія Г. зрабіла вялікі ўплыў на развіццё філас. думкі народаў СССР, у т. л. беларускага. Ідэі і працы Фалеса, Анаксагора, Ксенафана, Платона, Арыстоцеля, Зянона і інш. мыслі-целяў выкарыстоўваліся Ф. *Скарынам*, С. *Будным*, Л. *Зізаніем*, С. *Полацкім*, К. *Лышчынскім*, І. *Капіевічам* і інш.

Літаратура. Вытокі л-ры Г. ў фальклоры грэч. народнасцей, вядомых яшчэ з 2-га тысячагоддзя да н. э. Спецыфічная форма ант. вуснай нар. творчасці — міфалогія, якая адлюстроўвала прымітыўныя ўяўленні чалавека аб прыродзе і грамадскіх адносінах.

Аўтарам найб. стараж. літ. помнікаў — эпічных паэм «Іліяда» і «Адысея» (9—8 ст. да н. э.) — лічыцца *Гамер*. У 8—7 ст. да н. э. на змену гамераўскаму гераічнаму эпасу прыйшоў дыдакт. эпас *Гесіёда* (паэмы «Тэагонія», «Дні і турботы»). З узмацненнем сац.-паліт. барацьбы і з ростам самасвядомасці чалавечай асобы ў 7—6 ст. да н. э. асн. месца заняла лірыка. У цэнтры грамадз. лірыкі, якая развівалася ў жанрах элегіі і ямба,— патрыят. і сац.-паліт. тэматыка (Салон, Тыртэй, Феагнід, Алкей). Выкрывальным пафасам прасякнуты ямбы Архілоха. У мелічнай (песеннай) паэзіі (*Сапфо*, Алкей, *Анакрэонт*) аплявалася каханне, радасці жыцця, пачуццёвая асалода. Да мелічнай паэзіі належыць і харавая лірыка, дзе вылучыліся такія жанры, як міфалаг. гімны (Сіманід, Алкман) і песні ў гонар пераможцаў Алімпійскіх гульняў (Піндар). Паўлегендарным аўтарам баек быў *Эзоп*. У выніку паліт. і культ. ўмацавання Афінаў (5 ст. да н. э.) асабліва росквіту дасягнула драматургія. Праблемы развіцця і крызісу афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі пастаўлены ў трагедыях *Эсхіла*, *Сафокла* і *Еўрыпіда*. У камедыях *Арыстафана* (5—4 ст. да н. э.) выкрываецца антынар. Пелапанеская вайна і сац. заганы афінскай дзяржавы. У канцы 5 — пач. 4 ст. да н. э. вылучыліся гістар. (*Геродот*, *Фукідыд*, *Ксенафонт*), аратарская (Лісій, Дэмасфен) і філас. (*Платон*, *Арыстоцель*, *Эпікур*) проза. На аснове дасягненняў стараж.-грэч. л-ры і мастацтва Арыстоцель у «Паэтыцы» сфармуляваў пачаткі матэрыялістычнай эстэтыкі. Адыход ад пастаноўкі значных грамадска-паліт. праблем, абмежаванне рамкамі сямейна-бытавой тэматыкі ўласцівыя л-ры эпохі эліністычнай: *александрыйская паэзія* (Каліма́х, Апалоній Радоскі, Феакрыт), новаатычная бытавая камедыя (*Менандр*). У перыяд рымскага завалявання развіваліся гістар. проза («Паралельныя жыццёпісы» *Плутарха*) і сатыра (антырэліг. «Размовы» *Лукіяна*), позненагрэч. любоўны раман (творы Геліёдара і Лонга).

Архітэктура. У гамераўскі перыяд дамы і храмы будаваліся з дрэва, гліны і сырцовай цэглы.


Асн. тыпам жылога дома быў запазычаны з эгейскай архітэктуры мегарон (прамавугольная зала з агнішчам і ўваходным порцікам), па прынцыпе якога пазней ствараліся грэч. храмы. У перыяд архаікі склалася абліча горада з умацаваным узвышшам *(акропалем)*, дзе размяшчаліся свяцілішчы, і стыхійна заселеныя кварталамі рамеснікаў унізе в гандл. плошчай і месцам нар. сходаў — агарой. Сфарміравалася некалькі тыпаў храмаў: храм у антах (яго порцік утвораны 2 калонамі, што стаяць паміж выведзенымі за межы плана падоўжнымі сценамі), простыль (з калонным порцікам наперадзе), перыптэр (абкружаны каланадай з усіх бакоў; з 7 ст. да н. э. найб. пашыраны тып храма), дыптэр (з падвойнай каланадай). Храмавы комплекс абносіўся сцяною з манумент. уваходам *(прапілеі)*. У часы архаікі выпрацаваны *ордэры* — строгая сістэма нясўных *(антаблемент)* і нясучых *(калона)* частак. Найб. дасягненне архітэктуры дарычнага ордэра — храм Апалона ў Карынфе (2-я пал. 6 ст. да н. э.), іанічнага ордэра — храм Артэміды ў Эфесе (сярэдзіна 6 ст. да н. э.). Росквіт дэмакр. рабаўласніцкіх палісаў стварыў умовы для ўздыму архітэктуры ў перыяд класікі. Архітэктары, мяняючы маштаб і суадносіны элементаў ордэра, стваралі будынкі з індывідуальнымі рысамі — то велічныя, то інтымныя. У буд-ве храмаў пачалі карыстацца мармурам, што прывяло да большай ролі абломаў. Узор класічнай архітэктуры сярэдзіны 5 ст. да н. э.— храм Зеўса ў Алімпіі, якому ўласцівыя строгая велічнасць, ціхамірны спакой. Вяршыня ант. архітэктуры 2-й пал. 5 ст. да н. э.— Афінскі акропаль, збудаваны пад агульным кіраўніцтвам Фідыя. У комплексе акропаля — *Парфенон* (447—438, *Іктын* і *Калікрат*), *Эрэхтэён* (421—406), Прапілеі (437—432, Мнесікл), храм Нікі Апцярас (Бяскрылай Перамогі; 449—421, Каліт. зв. «гіпадамава» сістэма планіроўкі гарадоў (ад імя арх. Гіпадама з Мілета). Перыяд класікі на тэр. Г. завяршылі Філіпеён — мемарыяльнае збудаванне ў Алімпіі, помнік Лісікрата ў Афінах. У выніку Пелапанескіх войнаў і крызісу паліса буд. дзейнасць у Афінах заняпала. Цэнтрамі эліністычнай культуры сталі краіны ўсх. Міжземнамор'я, Гандхара, Бактрыя, Парфія. У гэты час ствараюцца новыя тыпы будынкаў, пашыраецца буд-ва гімнасіяў, палестраў, т-раў (найб. збярогся т-р у Эпідаўры). Прастата і гармонія формаў, уласцівыя класічнаму перыяду, саступаюць месца ўскладнёным грандыёзным кампазіцыям. Архітэктура Г. зрабіла моцны ўплыў на старарымскую, а потым на еўрап. архітэктуру. Яна не страціць значэння да нашага часу. Іл. гл. на ўкл.

Выяўленчае мастацтва. Скульптура Г. вядомая пераважна па рымскіх копіях, жывапіс — па апісаннях стараж. аўтараў. У гамераўскі перыяд пашыраны дробная пластыка і *базаніс* (геам. стыль). У часы *архаікі* ў базаніс існуе арыенталістычны стыль, пазней ён саступае месца чорнафігурнай, потым чырвонафігурнай тэхніцы. Скульптура сведчыць пра спробу эразумець пластыку цела. Былі распрацаваны тыпы статуй: курас (аголены юнак-атлет) і кора (апранутая дзяўчына), якім уласцівыя франтальнасць, статычнасць, дэкаратыўнасць і вытанчанасць. Вял. месца ў скульптуры займала пафарбаваная тэракота (маст. вырабы з абпаленай гліны). Росквіт скульптуры прыпадае на перыяд *класікі* і звязаны з буд-вам вял. храмаў, франтоны і метопы якіх аздабляліся рэльефамі. Фігуры кампазіцый франтонаў аб'ядноўвала адна тэма, больш свабодна перадаваўся рух. Найб. вядомыя рэльефы храмаў Афіны на в-ве Эгіна, Зеўса ў Алімпіі, Парфенона (асабліва «Шэсце афінскіх грамадзян»). Атычны скульптар *Міран* увёў у пластыку паказ складанага руху («Дыскабол», «Афіна і Марсій»). Палуляюцца творы пра гістар. падзеі: група «Гарматы і Арыстагітан» Крытыя і Несіёта. З жывапісцаў найб. вядомы Палігнот, які ўпершыню спрабаваў перадаць рэальную прастору. У 2-й пал. 5 ст. да н. э. грэч. майстры канчаткова парвалі з традыцыямі архаікі і ў дасканалых маст. вобразах паказвалі сваё ўлуленне пра ідэальнага грамадзяніна, прыгожага і доблеснага. У творчасці Фідыя найб. поўна і паслядоўна ўвасоблены маст. прынцыпы класікі. Фідый кіраваў буд-вам Афінскага акропаля і стварэннем скульптур франтонаў, метопаў скульптуры (пласцінкі з слановай косці і золату накладваліся на драўляны каркас) ён стварыў манумент. статуі Афіны Парфенас (для Парфенона) і Зеўса (для храма Зеўса ў Алімпіі). Уплыў Фідыя адчуваўся на творчасці яго сучаснікаў Крэсілая і Алкамена. Адначасова ў Аргасе працаваў *Паліклет*, аўтар тэарэт. трактата «Канон», майстар дакладных па прапорцыях статуй. Традыц. тэма атлета найб. дасканала ўвасоблена ў яго творы «Дарыфор». Жывапісцы 5 ст. да н. э. распрацоўвалі законы перспектывы і святлоценю (Апалодар, Зеўксіс). Мастацтву Г. ў 4 ст. да н. э. характэрны існаванне і барацьба некалькіх кірункаў. Скульптуры *Скопаса* (воіны з франтона храма Афіны ў Тегеі; «Менада»; фрыз «Амазонамахія» Галікарнаскага маўзалея) прасякнуты драм. пафасам, дынамікай. Творчасць *Праксіцеля* вызначаецца лірычнасцю («Афрадыта Кнідская», група «Гермес з Дыянісам» у Алімпіі). Прадстаўніком акад. кірунку быў Леахар («Апалон Бельведэрскі»). Завяршае класіку і пачынае эпоху эліністычнай творчасць *Лісіпа* (2-я пал. 4 ст. да н. э.). У яго статуях чалавек паказаны ва ўсёй складанасці ўнутранага аблічча («Апаксіямен»), у партрэтах выяўлены індывідуальныя рысы чалавека («Аляксандр Македонскі»). У галіне станковага жывапісу працаваў Апелес («Афрадыта Анадыямена»). У мастацтве эліністычнай эпохі ўзбагацілася тэматыка твораў, паглыбіўся змест, але яно пазбаўлена грамадзянскасці і гармоніі, што былі ўласцівы мастацтву класікі. Сярод твораў скульптуры розных школ: александрыйскай — «Алегорыя Ніла», пергамскай — вялікі фрыз «Гігантамахія» алтара Зеўса, радоскай — «Лаакаон» Агесандра, Палідора і Атэнадора. У традыцыях класікі створаны статуі Ніке Самафракійскай і Афрадыты Мілоскай (абедзве 2 ст. да н. э.). Пашырана тарэўтыка (посуд скарбаў Баскарэале і Гільдэсгейма), гліптыка, тэракота (статуэткі з Танагры). Іл. гл. на ўкл., а таксама ў арт. *Базаніс*.

Музыка. Першыя сведчанні пра песенна-танц. і інстр. мастацтва Г. адносяцца да 3-га тысячагоддзя да н. э. (крыта-мікенская культура). У гамераўскі перыяд пашырыліся песні пастухоў, жанчын, ткачоў, пахавальныя, пераможныя і інш., папулярнасцю карысталіся спевакі-казачнікі — аэды, рапсоды. У 8—5 ст. да н. э. старагрэч. музыка дасягнула высокага развіцця, заняла важнае месца ў грамадскім жыцці, у выхаванні грамадзян. Спаборніцтвы спевакоў, хораў, інструменталістаў уваходзілі ў праграмы гімнастычных і маст. («мусічных») гульняў. На 7—6 ст. да н. э. прыпадае росквіт хар. і сольнай лірычнай песні, развіваецца інстр. музыка для кіфары і аўлоса; значная роля належала музыцы ў класіч. трагедыі (спевы хору, меладызаваныя дыялогі, маналогі герояў). Антычная музыка пераважна вакальная, аднагалосая (найчасцей мужчынскія хар. унісонныя спевы ў дыяпазоне 2 актаў), цесна звязаная з метрыкай верша; натавалася літарамі грэч. і фінікійскага алфавітаў. У аснове гукараду — тэтрахорды, з якіх складаліся актаўныя лады. Стараж. грэкі стварылі

Трагічная маска (злева) з Пірэя. Канец 4 ст. да н. э. План грэчаскага тэатра класічнай эпохі: *а* — тэатрон, *б* — скена, *в* — праскеній, *г* — параскеній, *д* — архестра, *е* — пáрад, *ж* — ахвярнік.





вучэнне пра этас (маральна-выхаваўчую і грамадска-арганізуючую функцыю музыкі), рытм, лады. Многія ўведзеныя імі тэрміны ўжываюцца ў наш час («музыка», «мелодыя», «мелас», «рытм»).

Тэатр. Т-р Г. паходзіць ад культавых земляробскіх гульняў у час урачыстасцей у імя бога ўраджаю Дыяніса. Дыфірамбы і фалічныя песні, якія выконваліся на святы, мелі элементы дыялогу і тэатр. дзеяння і, паводле Арыстоцеля, далі пачатак трагедыі і камедыі. Т-р займаў важнае месца ў грамадскім жыцці грэкаў. Спектаклі наладжвалі арханты, вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы. Выдаткі на ўтрыманне і навучанне хору ўскладаліся на багатых грамадзян Афінаў — харэгаў. Пакавы рабіліся на вольным паветры. Будынак складаўся з 3 асн. частак: архестры (круглая пляцоўка, на якой выступалі хор і акцёры), скены (месца, дзе пераапраналіся і адкуль выходзілі акцёры) і тэатрона (месцы для гледачоў, размешчаныя на схілах узгоркаў). Самы стараж. з вядомых тэатр. будынкаў — т-р Дыяніса ў Афінах (6—4 ст. да н. э.). Спектаклі мелі характар спаборніцтваў, кожны драматург выступаў з тэтралогіяй (тры трагедыі і сатырачная драма). Жаночыя ролі выконвалі мужчыны. Акцёры былі ў масках, якія мянялі ў розных ролях і павят у адной ролі. Да эпохі эліністычнага неад'емнай часткай драмы быў хор, з якога ў 2-й пал. 6 ст. да н. э. паэт Феспід вылучыў асобнага выканаўцу — акцёра (пратаганіста). Грамадскае, паліт. і духоўнае жыццё народа знайшло адбітак у творчасці драматургаў Эсхіла, Сафокла, Еўрыпіда, Арыстафана, якія стварылі т-р вялікіх ідэй і дасканалай маст. формы. Эсхіл увёў 2-га акцёра (дэўтэраганіста), вызначыў класічную форму трагедыі. З імем Сафокла звязана ўвядзенне дэкарацый; у яго трагедыях налічыся 3-і акцёр (трытаганіст), паменшала роля хору і пабольшала дыялагічная частка. Апрача трагедый і камедый, ставіліся сатырачныя драмы — вясёлыя п'есы міфалаг. зместу, у якіх хор складаўся са спадарожнікаў Дыяніса — сатыраў. У пастаноўках выкарыстоўваліся спец. тэатр. машыны — эккілема, эарма, ці механэ, і інш. У эпоху эліністычнага тэатр. мастацтва адыходзіць ад значных грамадска-палітычных праблем. Трагедыя занепадае, стараж. атычная камедыя перастае існаваць. Сюжэты новай атычнай камедыі, вядомым прадстаўніком якой быў Менандр, звязаны пераважна з бытавымі адносінамі і асабістымі перажываннямі. Павялічылася і стабілізавалася колькасць вобразаў-масак. Паявіліся акцёры-прафесіяналы, акцёрскія т-вы, членамі якіх былі свабоднанароджаныя мужчыны. З 5 ст. да н. э. ў Г. паказвалі невялікія бытавыя і парадыйна-сатырычныя імправізаваныя сцэнкі — мімы. Сярод выканаўцаў міму былі і жанчыны, маскі адсутнічалі. Вельмі пашраны ў эліністычную эпоху і пантамім — мімічны танец, звычайна на міфалаг. сюжэт. У Паўд. Італіі і ў Сіцыліі ў 4—3 ст. да н. э. выконваліся фліякі — невялікія камедыйныя сцэнкі, якія адрозніваліся ад міму абавязковым ужываннем маскі. Тэатр. культура Г. зрабіла вялікі ўплыў на развіццё сусв. тэатр. мастацтва. Шырока выкарыстоўвалі грэч. спадчыну рымскі т-р, дзеячы Адраджэння і Асветніцтва. Дэмакр. традыцыі тэатра Г. не страцілі значэння і ў наступныя эпохі.

Кр.: Рус. пер.— Геродот. История в девяти книгах, т. 1—2, 2 изд., М., 1888; Ксенофонт. Греческая история, Л., 1935; Фукидид. История, т. 1—2, М., 1915; Аристотель. Афинская полития. Государственное устройство афинян, 2 изд., М., 1937; Полибий. Всеобщая история в сорока книгах, т. 1—3, М., 1890—99; Плутарх. Сравнительные жизнеописания, т. 1—3, М., 1961—64.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об античности, Л., 1932; Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ягож. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 2, Мн., 1952; Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Полн. собр. соч., т. 29); Древняя Греция, М., 1956; История Древней Греции, М., 1962; Асмус В. Ф. История античной философии, М., 1965; История греческой литературы, т. 1—3, М.—Л., 1946—60; Тронский И. М. История античной литературы, Л., 1957; Радциг С. И. История древнегреческой литературы, 3 изд., М., 1969; Всеобщая история искусств, т. 1, М., 1956; Всеобщая история архитектуры, т. 1, М., 1958; Чубова А. П. и Иванова А. П. Античная живопись, М., 1966, (бібліягр.); Вощинина А. И. Античное искусство, М., 1962; Блаватский В. Д. Греческая скульптура, М.— Л., 1939; Колпинский Ю. Д. Искусство Эгейского мира и Древней Греции, М., 1970; Richter G. M. A., A handbook of Greek art, London, 1959; Античная музыкальная эстетика, М., 1960; Грубер Р. И. Всеобщая история музыки, ч. 1, 3 изд., М., 1965; Каллистов Д. П. Античный театр, Л., 1970; Мокульский С. История западноевропейского театра, т. 1, М., 1936.

Ф. М. Нячай (гісторыя), *А. С. Клаўчэня* (філасофія), *Н. І. Лапідус* (літаратура). Мінск; *І. І. Саверкіна* (архітэктура, выяўленчае мастацтва). Ленінград; *Г. С. Глушчанка* (музыка). Мінск; *Л. Я. Сяргінская* (тэатр). Масква.


ГРЭЦЫЯ, Каралеўства Грэцыя (Vasileion tis Ellados), дзяржава на Пд Еўропы. Займае паўд. частку Балканскага п-ва і шматлікія а-вы ў Эгейскім і Іанічным м. Пл. 131,9 тыс. км², нас. 8838 тыс. чал. (1969). Сталіца Афіны. Адміністрацыйна краіна падзяляецца на 50 номаў (абласцей) і 1 аўт. вобласць. Існуе падзел на 9 гістар. абласцей: Цэнтр. Г. з в-вам Эўбея, Пелапанес, Фесалія, Эпір, Іанічныя а-вы, Фракія, Македонія, Крыт, а-вы Эгейскага м. (карту гл. на ўкл.).



Дзяржаўны лад. Канстытуцыйная манархія. Дзейнічае канстытуцыя 1968. Мае антыдэмакр. характар і заклікана замаскіраваць ваен.-фаш. дыктатуру. Паводле канстытуцыі дзяржаву ўзначальвае кароль (з 13.12.1967 кароль у эміграцыі, функцыі яго выконвае рэгент). Фактычна ўся ўлада ў краіне ў руках ваен. хунты, а парламент ператвораны ў рэгістрацыйную палату.

Прырода. Г. займае найбольш паразаную морам частку Балканскага п-ва. Марскія граніцы ў 12 разоў даўжэйшыя за сухапутныя, узбярэжжа моцна расчляненае, шмат зручных гаваняў. Больш за ⅘ тэр. занята горамі. Уздоўж узбярэжжа Іанічнага м. цягнецца горны масіў Пінд з вяршынямі вышэй за 2 тыс. м. На ПнУ краіны адгор'і Радопаў і гор Македоніі з найвышэйшым пунктам Г.—

Узбярэжжа вострава Керкіра.






Алімпам (2911 м). Далей на Пд раўніна Фесалії. Паўд. ч. краіны і Пелапанес таксама заняты гарамі. Самая значная нізіна — Саланікская па р. Вардар. Тэрыторыя Г. вызначаецца сейсмічнасцю, на востраве Тыра дзейны вулкан. Запасы карысных выкапняў невялікія. Ёсць жал. руда (в-аў Эўбея, п-аў Халкідыкі). Каля Лаўрыяна непадалёку ад Афінаў здабываюцца жалезная, медная, свінцова-цынкавая, алавяная і хромавая руды. Баксіты каля падножжа Парнаса, буры вугаль на в-ве Эўбея і ў Македоніі, ёсць мармур і інш. буд. матэрыялы. Клімат міжземнаморскі. Т-ра паветра—студз. 4 на Пн, 10—12 °С на Пд, ліп. ад 24 на Пн да 28 °С на Пд. Ападкаў каля 500—600 мм за год, пераважна зімою. У гарах клімат больш халодны і вільготны. Рэкі каротк1я і малаводныя, за выключэннем Марыцы, Нестаса, Стрымона, Вардара, якія належаць Г. ў сваіх нізоўях. На ўзбярэжжы субтрапічная расліннасць на чырваназемных або карычневых глебах, вышэй шыракалістыя лясы (дуб, бук, ліпа, клён), потым хвойныя. На самых высокіх горных масівах — альпійскія лугі. Прыродная расліннасць на прыдатных тэрыторыях выцеснена культурнай, асабліва на Пд. Жывёльны свет: алень, сарна, воўк (вельмі рэдка), шмат грызуноў, на а-вах Эгейскага м.— дзікая каза. Шмат птушак, яшчарак, ёсць гадзюкі.

Насельніцтва. 95% насельніцтва грэкі. Жывуць таксама македонцы, туркі, албанцы, арамуны (народ раманскай моўнай групы), балгары. Дзярж. мова грэчаская. Большая частка веруючых праваслаўныя. Гарадскога нас. 40%. Найб. шчыльна населена ўзбярэжжа. Самыя вялікія гарады (1968, млн. ж.): Афіны (з прыгарадамі і Пірэем) 2,0, Саланікі (з прыгарадамі) 0,4.


Гістарычны нарыс. Чалавек на тэр. сучаснай Г. жыў яшчэ ў эпоху палеаліту. У перыяд распаду родавага ладу ўзніклі рабаўладальніцкія гарады-дзяржавы (полісы), найб. магутныя з іх Афіны і Спарта (гл. *Грэцыя Старажытная*). У 146 да н. э. Г. падпала пад уладу Рыма, з 4 ст. н. э. ўваходзіла ў склад Візантыі. У перыяд панавання Візантыі ў Г. склаліся і развіліся феад. адносіны. З спрадзіны 15 ст. Г. пад уладай Асманскай імперыі. Грэкі няраз паўставалі супраць тур. панавання (у перыяд тур.-венецыянскай вайны 1463—79 у 1571, 1611). У 1814 у Адэсе ўзнікла тайнае рэвалюц. т-ва «Філікі Этэрыя», якое пачало рыхтаваць паўстанне супраць тур. прыгнёту. У сак. 1821 т-ва ўзняло сцяг *грэчаскага нацыянальна-вызваленчага паўстання 1821—29*, у выніку якога і з дапамогай Расіі (Расія перамагла Турцыю ў вайне 1828—29) Г. заваявала незалежнасць. У склад Г. ўвайшлі не ўсе тэр., населеныя грэкамі (Эпір, Фесалія, Крыт, Самас і інш.). У Г. ўсталяваўся манарх. лад. Англ. пазыкі 1824, 1825 і 1832 далі пачатак фін. залежнасці Г., якая ўзмацнілася пасля плёўдалай для Г. вайны з Турцыяй 1897. У канцы 19 — пач. 20 ст. паскорылася развіццё капіталізму, парасткі якога паявіліся яшчэ ў 18 ст. Развіццё прамысловасці выклікала рост пралетарыяту. У 2-й пал. 90-х г. узніклі першыя прафсаюзы, якія ўзначалілі забастовачны рух. Г. ўваходзіла ў *Балканскі саюз 1912*, удзельнічала ў *Балканскіх войнах* 1912—13, у выніку якіх атрымала Паўд. Македонію, Зах. Фракію і Эпір. На пачатку 1-й сусв. вайны Г. трымалася нейтралітэту. Аднак у кастр. 1915 англа-франц. войскі акупавалі Саланікскую правінцыю, усталявалі эканам. блакаду Г. Улетку 1917 Г. ўступіла ў вайну на баку Антанты. Усё гэта прывяло да эканам. разрухі, фін. крызісу і голаду ў краіне. Ахвяры і нястачы выклікалі ўздым рэвалюц. руху, які ўзмацніўся пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. У ліст. 1918 створана Сацыяліст. рабочая партыя Г. (у 1924 перайменавана ў кампартыю Г.— КПГ). Паводле Севрскага мірнага дагавору з Турцыяй (1920) да Г. павінны былі адысці Ізмір з прылеглым да яго раёнам, Усх. Фракія з Галіпальскім п-вам, а-вы Імроз, Тэнедос і інш. Пацярпеўшы паражэнне ў вайне супраць Турцыі 1919—22, распачатай пры заахвочванні Вялікабрытаніі і Францыі, Г. страціла Усх. Фракію, Ізмір і некат. інш. тэрыторыі. У 1923—25 адбыліся вял. забастоўкі і сялянскія выступленні. У сак. 1924 Г. ўстанавіла дыпламат. адносіны з СССР. 25.3.1924 Г. абвешчана рэспублікай. На працягу 20-х г. краіна заставалася аграрнай, адсталай. У перыяд сусв. эканам. крызісу 1929—33 разгарнуўся магутны рабочы і сялянскі рух, узмацнілася саперніцтва паміж бурж.-памешчыцкімі партыямі. У 1935 у выніку фальсіфікаванага плебісцыту рэстаўрыравана манархія. 4.8.1936 устаноўлена ваенна-фаш. дыктатура ген. І. Метаксаса. Усе паліт. партыі былі аб'яўлены па-за законам.




Пірэй.

У пач. 2-й сусв. вайны 1939—45 Г. імкнулася заняць пазіцыю нейтралітэту. 28.10.1940 войскі фаш. Італіі ўварваліся ў Г., але сустрэлі гераічнае супраціўленне арміі і народа і былі выгнаны з яе тэр. 6.4.1941 у Г. ўварвалася ням.-фаш. армія і да 2.6.1941 акупавала краіну. КПГ была адзінай партыяй, якая заклікала народ да барацьбы супраць захопнікаў. Рух Супраціўлення ў Г. асабліва ўзмацніўся з пачаткам Айч. вайны Сав. Саюза 1941—45. Па ініцыятыве КПГ 27.9.1941 створаны нац.-вызв. фронт (ЭАМ). У снеж. 1941 ЭАМ стварыў Грэч. народна-вызв. армію (ЭЛАС), якая да лета 1944 вызваліла ²/₃ тэр. Г. У вызваленых раёнах пачалі закладвацца асновы нар.-дэмакр. улады (дэмакр. органы самакіравання, выбарныя суды, нар. міліцыя і інш.). У выніку пераможнага наступлення сав. войск на Балканах і пад націскам сіл Супраціўлення ням.-фаш. войскі ў кастр. 1944 пакінулі Г. Аднак імперыяліст. сілы і ўнутраная рэакцыя перашкодзілі народу выкарыстаць плён перамогі. У пач. кастр. 1944 у Г. высадзіліся англ. войскі. Неўзабаве ў Афіны вярнуўся з Каіра эмігранцкі ўрад. Рэакц. сілы, апіраючыся на англ. інтэрвентаў, разгарнулі масавы тэрор супраць дэмакр. сіл. 5.12. 1944 англ. войскі пачалі ваен. дзеянні супраць ЭЛАС. 12.2.1945 ЭАМ, каб спыніць кровапраліцце, падпісаў пагадненне з урадам, якое прадугледжвала адмену ваен. становішча, амністыю, роспуск усіх узбр. атрадаў, плебісцыт па пытанні дзярж. ўладкавання і інш. ЭАМ выканаў абавязацельствы і раззброіў ЭЛАС. Урад жа выкарыстаў гэтую аброю для расправы з дэмакр. сіламі. Ва ўмовах тэрору 31.3.1946 былі праведзены парламенцкія выбары (кампартыя іх байкатавала) і плебісцыт (1.9.1946), у выніку якога рэстаўрыравана манархія. З дапамогай англа-амер. імперыялізму рэакц. сілы справакавалі грамадз. вайну. У 1947 ЗША навязалі Г. *«Трумэна дактрыну»*. Створаная ў кастр. 1946 Дэмакр. армія Г. (ДАГ) тры гады гераічна змагалася за нац. незалежнасць, дэмакратыю і сац. прагрэс. Але сілы былі няроўныя. У кастр. 1949 ДАГ была вымушана спыніць узбр. барацьбу. Прагрэс. дзеячы зазналі цяжкія ганенні. Узмацнілася эканам. і паліт. залежнасць краіны ад ЗША. У люг. 1952 Г. стала чл. НАТО. Паводле грэка-амер. пагаднення 12.10.1953 ЗША атрымалі права бескантрольна выкарыстоўваць грэч. тэр., марскую і паветраную прастору для ваен. мэт. У 1962 Г. ўступіла ў т. зв. «Агульны рынак», што спрыяла далейшаму

Паўвостраў Пелапанес. Бухта (злева). Рыбакі.





падпарадкаванню яе эканомікі замежнаму капіталу. У 60-я г. памацнеў дэмакр. рух на чале з КПГ'і Адзінай дэмакр. левай партыяй Г. (ЭДА, засн. ў 1951). У выніку парлам. выбараў у ліст. 1963 і лют. 1964 да ўлады прыйшла партыя «Саюз цэнтра» (засн. ў 1961). Яе лідэр Г. Папандрэу сфарміраваў урад, які ажыццявіў некат. прагрэс. мерапрыемствы. У краіне акрэсліўся зрух улева. Аднак урад Папандрэу быў непаслядоўны, меў тэндэнцыю да згодніцтва з правымі, адмаўляўся ад супрацоўніцтва з левымі сіламі. У ліп. 1965 пад націскам каралеўскага двара ён пайшоў у адстаўку. Краіна была ўцягнута ў глыбокі паліт. крызіс. Ва ўмовах востpай барацьбы сіл дэмакратыі і рэакцыі грэч. ваеншчына, цесна звязаная з тайнымі службамі ЗША і НАТО, зрабіла 21.4.1967 ваенны пераварот і ўсталявала ваенна-дыктатарскі рэжым фаш. тыпу. Была адменена канстытуцыя, распушчаны дэмакр. партыі і арг-цыі; а іх кіраўнікі арыштаваны. 13.12.1967 кароль Канстанцін спрабаваў скінуць ваен. хунту, але беспаспяхова і эміграваў у Італію. 29.9.1968 ва ўмовах дзеяння надзвычайных законаў адбыўся рэферэндум па пытанні аб новай канстытуцыі, якая ўзаконьвае рэжым ваен. дыктатуры. Нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, у краіне мацнее супраціўленне ваен. хунце. КПГ імкнецца аб'яднаць усе антыдыктатарскія сілы ў адзіны фронт, каб скінуць рэжым ваен. дыктатуры і адрадзіць краіну на аснове дэмакратыі і сац. прагрэсу.

Гаспадарка. Г.— аграрная краіна з слабаразвітай прамысловасцю, моцна залежыць ад замежнага капіталу. Вылучаюцца экспартныя галіны с. гасп., марское судаходства і гандаль. Прамысловасць пераважна лёгкая і горназдабыўная. Энергетыка базіруецца на лігніце і прывазной нафце. Магутнасць эл. станцый 1503 тыс. *квт* (1967, ЦЭС—709 тыс. *квт*, ГЭС—704 тыс. *квт*). Вытворчасць эл. энергіі 8,0 млрд. *квт-гадз* (1969). Здабыта ў 1969 бакстаў 1,9 млн. *т*, вугалю (лігніту) 6,7 млн. *т*, жал. руды (50% Fe) 454 тыс. *т*. Здабываюцца пірыт, хромшпат, сінтэтычна-цынкавы, марганцавыя, нікелевыя руды. Металургія прамысловасць развіта слаба; гадавая магутнасць плавільняў 200 тыс. *т* сталі і 75 тыс. *т* алюмінію. У апрацоўчай прамысловасці пераважаюць дробныя прадпрыемствы. Вялікі развіццё тэкстыльнай прамысловасці (бавоўнапрадзільныя, прамысловасць штучнага і сінтэтычнага валакна, шоўку, капрону, нейлону, лавсану і інш.— рэзкае падзенне ў 1967—68 гг.), харчовая (апрацоўка тытуню, вытв. алівавага алею, цукру, кансерваў з садавіны і інш.— рэзкае падзенне ў 1967—68 гг.). Судабудаванне і мэтанакіраванае. Прадпрыемствы буд. прамысловасці: цэлюлозна-папяровыя, парцэляна-фаянсавыя і інш. буд. матэрыялаў. Вытворчасць цэменту 4,8 млн. *т* (1969). Хім. прамысловасць: нафтаперапрацоўка, вытворчасць серкавай к-ты.

У с. гасп. запасы жалезнай і малочнай самадзейнага насельніцтва. Пераважаюць дробныя гасп. ад. да 1 *га*, каля 50% worных зямель належыць памешчыкам. Апрацоўваецца каля 38% тэр. краіны, арашэнне больш чым на 600 тыс. *га* (1967). Гал. раёны земляробства: раўнінныя часткі Македоніі, Цэнтральнай Г. і Пелапанеса, Фесалія. Пераважае раслінаводства, вырошчванне экспартных культур: тытуню (Македонія, Фесалія, Фракія), вінаграду і аліваў (на ўзбярэжжах). Гэтыя культуры даюць каля ¾ экспарту краіны. Атрымана (1969, тыс. *т*): аліваў 880, пшаніцы 1771, ячменю 600, кукурузы 400, рысу 108, бавоўны 96, тытуню 81, цытрусавых 570, вінаграду 1629 (1968). У жывёлагадоўлі гал. ролю адыгрывае гадоўля авечак і коз на горнай пашы. У 1969 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 1,1, авечак 7,8; у 1967/68 свіней 0,6, коней 0,3, мулаў 0,2, аслоў 0,4, коз каля 4,2. Рыбалоўства (штогод каля 125 тыс. *т*) і здабыча губак. Развіты замежны турызм. Важная роля ў гаспадарцы належыць марскому транспарту. Ён забяспечвае 90% усіх знешніх гандл. сувязей і перавозкі інш. краін. У 1969 танаж гандл. флоту каля 9,7 млн. бр. рэг. *т*. Гал. порты Пірэй і Саланікі. Даўж. чыгунак 2576 *км*, шашэйных дарог 39 тыс. *км*. Развіта грамадз. авіяцыя, гал. цэнтр Афіны. Г. экспартуе с.-г. прадукты (тытунь, аліўкі, цытрусавыя, разынкі і інш.) і мінер. сыравіну. Імпарт: паліва (нафта і нафтапрадукты, каменны вугаль), прамысл. вырабы (машыны, транспартныя сродкі і інш.), харч. прадукты і лес. Гал. гандлёвыя партнёры — ЗША і краіны «Агульнага рынку». Экспарт пакрывае каля ⅓ кошту імпарту; пасіў знешнегандл. балансу пакрываецца за кошт валютных даходаў ад замежнага турызму, даходаў гандл. флоту, грашовых пераводаў эмігрантаў і замежных капіталаўкладанняў (ЗША, ФРГ, Францыя і інш.). Грашовая адзінка — драхма.

Узброеныя сілы Г. складаюцца з сухап. войск, ВПС, ВМС. У 1968 налічвалі каля 182 тыс. чал. Узначальваюцца міністрам нац. абароны. Сухап. войскі (каля 121 тыс. чал.) маюць пяхотную армію (3 армейскія корпусы), дывізіённа-дэсантныя войскі, войскі ўнутр. рабіўў і астравоў; 2 дывізіёны танкавых рэйнераў «Онест Джон». У складзе ВПС (каля 22 тыс. чал.) павет. армія, якая мае на ўзбраенні каля 250 баявых самалётаў, а ім 36 зенітна-ракетных дывізіёнаў. ВМС складаюцца з 2 аператыўных аб'яднанняў — ВМС Эгейскага і ВМС Іанічнага і Міжземнага морэў, усяго каля 130 пасудзін нараблёў. Ёсць 3 пасудзіны лодкі. Асн. частка ўзбр. сіл Г. (пяхотная і павет. армія) перакінута ў склад аб'яднанняў узбр. сіл НАТО). Усе войскі ўзброены амер. тэхнікай.

Адміна адрозьн. Мясцова-сам. органы прадстаўнічыя на пачатк. дэпарт., муніцыпальныя і грамадскія (прэфектурныя і муніцыпальныя) ўпраўленні, фінансавыя. Дэпарт. выдаткі на адзіную акцыю ў 1964 склалі 5,5% агульнага бюджэту. У 1966 было 1154 бальніцы (з іх 23% дзяржаўныя) на 50,3 тыс. ложкаў (5,2 ложка на 1 тыс. ж.). У пачатку 1967 працавала 122 829 урачоў (1980 чал. прыпадае на 1 урача), акруг каля 30000 зубных. Функцыянуюць 2 мед. ф-кі ун-тэт у Афінах і Салонікі. У 1967 прадпрымальнасць 18,7 на 1 тыс. ж., дробных. Выдз. прадпрымальнасць 34,3 на 1 тыс. ж., дробных. Выдаткі прадпрымальнасці на 1 тыс. ж. складаюць 34,3

(А. Метаксас). Быў выпрацаваны тып малапавярховага (С. Клеантыс, Л. Каўтадзоглу), а ў пач. 20 ст. новага для Г. шматпавярховага (К. Кіцыкіс) дома. Акрамя Афінаў значныя работы вяліся ў Пірэі і Саланіках. Сучасная архітэктура развіваецца слаба, пераважна будуюцца аталі з выкарыстаннем новых матэрыялаў і формаў.

Мастацтва Г. перыяду тур. панавання развівала традыцыі візант. жывапісу. Нац. мастацтва сфарміравалася ў гады барацьбы супраць тур. прыгнёту (Н. Купелакіс і інш.). Мастакі-рэалісты Н. Літрас, Н. Гізіс у сваіх творах адлюстравалі жыццё грэч. народа, К. Валанакіс і Я. Алтамурас стварылі школу грэч. пейзажа. Скульптура развівалася ў акад. традыцыях (Л. Сохас). Пасля 1-й сусв. вайны мастацтва Г. перажывае крызіс. Шэраг мастакоў (З. Тамопулас і інш.) прытрымліваюцца традыцый рэалізму, процістаўляючы сваё мастацтва мадэрнісцкім плынням. Рэаліст. кірунак памацнеў у час 2-й сусв. вайны пад уплывам гераічнай барацьбы грэч. народа (Д. Мегалідыс, В. Семерцідыс). Дэмакр. мастацтва 50—60-х г. развіваецца ва ўмовах жорсткай класавай барацьбы (В. Семерцідыс, А. Тасас, Д. Кацыкаліс, Н. Манусіс). У апошні час фармаліст. кірункі падтрымліваюцца хунтай, якая захапіла ўладу ў краіне.

Музыка. Грэч. муз. культура — адна з найб. старадаўніх у свеце (гл. *Грэцыя* Старажытная). У сярэд. вякі грэч. музыка развівалася ў рэчышчы візант. культуры. З 15 ст. тур. прыгнёт затрымаў развіццё грэч. мастацтва. У 17—18 ст. пашырыліся песні клефтаў — барацьбітоў супраць тур. прыгнятальнікаў. З нар. муз. інструментаў: разнавіднасці лютні, ліры, падоўжная флейта, валынка. Асабліва папулярныя бузукі, мандаліна, васкрыпка, кларнет (уваходзяць у склад сучаснага нар. аркестра). Нац. прафесійная музыка пачала складвацца ў 30-я г. 19 ст. Раней нац. мастацтва развівалася толькі на Іанічных а-вах, дзе не было тур. панавання. З кампазітараў 19 ст.: Н. Мандзарас, С. Ксіндас, П. Карэр, С. Самарас. Заснавальнікамі новагрэч. нац. муз. школы сталі М. Каламірыс, Д. Лаўрангас, М. Варвагліс, Г. Ламбелет, З. Рыядыс. З інш. кампазітараў: А. Евангелатас, А. Ксенас, Д. Левідыс, А. Незерытыс, П. Петрыдыс. Міжнар. прызнанне набылі песні М. *Тэадаракіса*. Сярод грэч. выканаўцаў дырыжор Дз. Мітропулас, спявачка М. Калас. У Г. функцыянуюць: Нац. оперны т-р (Афіны), 5 сімф. аркестраў, ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Д. Страту, хор дзяцей пад кіраўніцтвам Ф. Візантыу. Адзіная дзярж. кансерваторыя ў Саланіках, 4 кансерваторыі прыватных т-раў.

Тэатр. Першыя спробы адрадзіць т-р зроблены ў 17 ст. на в-ве Крыт і ў 18 ст. на в-ве Закінф. У Афінах пастаянныя трупы ўзніклі на пач. 60-х г. 19 ст. К. Хрыстоманас у 1901 арганізаваў т-р «Новая сцэна». Створаны дзярж. Каралеўскі т-р (1901). У 10—20-я г. 20 ст. тэатр. мастацтва занепадае. Вылучаецца творчасць рэж. Ф. Палітыса, пастаноўкі Нац. т-ра (засн. ў 1932). У гады фаш. дыктатуры і акупацыі тэатр. жыццё ў застоі. У наступныя гады прадаўжалася барацьба за дэмакр. мастацтва: спектаклі Маст. т-ра (засн. ў 1942 рэж. К. Кунам), Грэч. нар. т-ра (засн. ў 1955 М. Катракісам), Новага т-ра (засн. ў 1959 В. Дыямандопуласам і М. Алкеу), Пірэйскага т-ра (засн. ў 1957 Дз. Рандырысам), «Тэатра 1959», «Тэатра 1961». Фаш. дыктатура (з 1967) спыніла тэатр. жыццё Г., у рэпертуар т-раў уводзіцца легкаважная драматургія.

Кіно. У 1906 зняты першы хранік. фільм, у 1911—12 кінакамедыі з С. Дзімітракопуласам. У 1-ю сусв. вайну выпускалася пераважна ваен. кінахроніка. Маст. фільмы: «Прыкуты Праметэй» (1929, рэж. Д. Газіядыс), «Дафніс і Хлоя» (1931, Д. Ласкас), «Голас сэрца» (1943, Л. Іанопулас), «Апладысменты» (1944, Г. Дзавелас). З 50-х г. значна павялічылася вытворчасць фільмаў: «Дзеці Элады» і «Заліў пачуццяў» (1951, 1957, Г. Зервас), «Фальшывая манета» і «Антыгона» (1955, 1961, Дзавелас), «Горкі хлеб» і «Час гневу» (1951, 1968, Г. Грыгарыу), «Чароўны горад» і «Рака» (1954, 1960, Н. Кундурас), «Стэла», «Дзяўчына ў чорным» і «Электра» (1955, 1957, 1962, М. Какаяніс), «Да карабля» (1966, А. Дамілнас), «Тварам у твар» (1966, Р. Мантуліс). Пасля 1967 некат. кінадзеячы арыштаваны, часткова эмігравалі.

Літ.: Шпаро О. Б. Освобождение Греции и Россия (1821—1829), М., 1965; Великая Октябрьская социалистическая революция и Греция. Сб. ст., Ташкент, 1968; Кирьякидис Г. Д. Греция во второй мировой войне, М., 1967; VIII съезд Коммунистической партии Греции, М., 1962; Русос П. Октябрьская революция и Греция, [пер. з грэч.], М., 1967; Попов В. Д. Экономика современной Греции, М., 1971; Греческие народные песни, пер. с греч., М., 1957; Рассказы греческих писателей, пер. с новогреч., М., 1959; Эхо каторги, пер. с греч., М., 1964; Полевой В. М. О формировании национальной школы нового греческого искусства, у кн.: Современное изобразительное искусство капиталистических стран, М., 1961.

У. У. Бодрын (прырода, гаспадарка), *Г. А. Касвін* (асвета), *Яніс Мочас* (літаратура). Масква; *І. І. Саверкіна* (архітэктура, выяўл. мастацтва). Ленінград.

ГРЭЧАСКАЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАЕ ПАЎСТАННЕ 1821—29 супраць турэцкай няволі. Паўстанне адыграла ролю вызв. рэвалюцыі. Створаная ў выніку яго самастойная дзяржава спрыяла сац. і нац. развіццю грэч. народа. Г. н.-в. п. актывізавала вызв. барацьбу ўсіх балканскіх народаў, паскорыла прагрэс. сілы Еўропы.

Для падрыхтоўкі паўстання шмат зрабіла арганізаванае (1814) грэч. патрыётамі ў Адэсе тайнае рэвалюц. т-ва «Філікі Этэрыя» («Т-ва сяброў»), дзейнасць якога ахапіла ўсю Грацыю і грэч. калоніі за мяжой. У 1821 кіраўнік т-ва сын былога гаспадара Валахіі ген. рус. арміі А. Іпсіланці з атрадам, у якім быў В. *Гарноўскі* з Беларускай губ., перайшоў з Расіі на тэр. Малдавіі, каб падняць на барацьбу балканскія народы. У гэты час у Дунайскіх княствах пачалося паўстанне на чале з Т. Уладзімірэску. Паміж Іпсіланці і Уладзімірэску ўзніклі вострыя рознагалоссі з-за адмены прывілеяў баяр і грэч. духавенства. Гэта выкарысталі туркі і задушылі паўстанне. Нягледзячы на паражэнне, яно дало штуршок узбр. барацьбе грэч. народа. У канцы сак. паўстанне пачалося ў Марэі, хутка пашырылася на ўсю кантынентальную Грэцыю і а-вы Эгейскага м. Да канца 1821 паўстанцы вызвалілі значную частку краіны. У студз. 1822 Нац. сход у Эпідаўры абвясціў Грэцыю незалежнай, прыняў першую канстытуцыю. У лют. 1825 на дапамогу тур. султану выступілі егіп. армія і флот. Грэч. паўстанцаў падтрымала грамадскасць многіх краін свету. У Грэцыю выехалі добраахвотнікі з замежных краін. Сярод іх вядомы англ. паэт Дж. Байран. У 1827 Расія, Вялікабрытанія і Францыя прапанавалі Турцыі спыніць ваен. дзеянні, даць Грэцыі аўтаномію. Тур. ўрад адхіліў гэтыя патрабаванні. У адказ руска-англ.-франц. эскадра разбіла ў бухце Наварын тур.-егіп. флот. У 1828 Расія абвясціла Турцыі вайну. Тур. султан мусіў прызнаць (1829) аўтаномію Грэцыі, а ў 1830 яе незалежнасць.

Літ.: Энгельс Ф. Что будет с Европейской Турцией?, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 9; Арш Г. Л. Греческое освободительное движение конца XVIII — начала XIX в. и русско-греческие связи (Этеристы в России), М., 1969 (дыс.).


А. Дз. Зубар. Мінск.

ГРЭЧАСКАЕ ПІСЬМО, гістарычна першая гукавая сістэма пісьма, якая мела літары для абазначэння не толькі зычных, але і галосных гукаў.

Першыя гістар. помнікі з 8—7 ст. да н. э. знойдзены на а-вах Тыра, Мілас і інш. Большасць вучоных лічыць, што Г. п. бярэ пачатак з *фінікійскага пісьма*. Запазычыўшы яго, грэкі прыстасавалі некат. знакі для абазначэння галосных, уключылі новыя для абазначэння спецыфічна грэч. гукаў, паступова перайшлі на пісьмо злева направа. Пазнейшае Г. п., т. зв. «архаічнае», распалася на заходнюю (дала пачатак этрускаму і лацінскаму пісьму) і ўсходнюю разнавіднасці. З усх. разнавіднасці развілося т. зв. «класічнае» Г. п., на яго аснове візантыйскае, з візантыйскага сучаснае Г. п. (гл. табл.). Ад візант. пісьма бярэ пачатак *кірыліца*, з якой выпрацаваліся рускае, беларускае, украінскае, сербскае і інш. сістэмы пісьма.

ГРЭЦЫЯ





Вялікія	Малыя	Назва	Вымаўленне
Α	α	ἄλφα а́льфа	[а] (кароткае або доўгае)
Β	β	βῆτα ві́та	[б]
Γ	γ	γάμμα га́ма	[г]
Δ	δ	δέλτα дэ́льта	[д]
Ε	ε	ἒ ψιλόν э псілóн	[э] (толькі кароткае)
Ζ	ζ	ζῆτα дзі́та	[дз]
Η	η	ἦτα э́та	[э] (толькі доўгае)
Θ	θ	θῆτα тэ́та	[т]
Ι	ι	ἰῶτα іо́та	[і] (кароткае або доўгае)
Κ	κ	κάππα ка́па	[к]
Λ	λ	λάμβδα ла́мбда	[л] (вымаўляецца як лацінскае l)
Μ	μ	μῦ мі	[м]
Ν	ν	νῦ ні	[н]
Ξ	ξ	ξῖ ксі	[кс]
Ο	ο	ὂ μικρόν о мікро́н	[о] (толькі кароткае)
Π	π	πῖ пі	[п]
Ρ	ρ	ῥῶ ро	[р]
Σ	ς σ	σίγμα сі́гма	[с]
Τ	τ	ταῦ тау	[т]
Υ	υ	ὖ ψιλόν і псілóн	[у] французскае або [ü] нямецкае (доўгае або кароткае)
Φ	φ	φῖ фі	[ф]
Χ	χ	χῖ хі	[х]
Ψ	ψ	ψῖ псі	[пс]
Ω	ω	ὦμέγα о мега́	[о] (толькі доўгае)

Грэчаскі алфавіт.

Літ.: Истрин В. А. Возникновение и развитие письма, М., 1965, с. 331—351; Видеман Ф. Начатки исторического греческого письма, Лейпциг, 1908; Дирингер Д. Алфавит, пер. с англ., М., 1963. *А. І. Харсекін.* Мінск.

ГРЭЧАСКАЯ МОВА (элінская мова), самаст. адгалінаванне *індаеўрапейскіх моў*. Дзярж. мова Грэцыі і (разам з турэцкай) Кіпра. Грэкамоўнае насельніцтва ёсць у ЗША, Турцыі, ААР, Албаніі, Італіі і ў СССР (на Украіне, Каўказе і ў Сярэд. Азіі). На Г. м. гаворыць (1968) каля 9,7 млн. чал., у т. л. ў Грэцыі 8, на Кіпры каля 0,5 млн.

У гісторыі развіцця Г. м. вылучаюць 4 перыяды. 1) У 20—4 ст. да н. э. існавалі асобныя старажытнагрэч. дыялекты: іанійска-атычны, ахейскі, або аркада-кіпрскі, эалійска-беатыйскі і дарыйскі, якія склаліся на Пд Балканскага п-ва і а-вах Эгейскага м. пры перасяленні туды (відаць, з басейна Дуная) элінскіх плямёнаў. Ужо ў сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. на ахейскім дыялекце існавала складовае пісьмо, у 8 ст. да н. э. пашыраецца літарнае (гл. *Грэчаскае пісьмо*). 2) На аснове атычных гавораў у 3 ст. да н. э. складваецца агульная ўсяму эліпскаму свету мова кайнэ. Як і раннія дыялекты, яна мела доўгія і кароткія галосныя, асобны рад прыдыхальных зычных, музычны націск, у марфалогіі — развітую сістэму дзеяслоўных формаў, крыху спрошчанае іменнае скланенне, багатае словаўтварэнне. 3) У 4 ст. кайнэ ператвараецца ў сярэднегрэч. мову — літ. мову Візант. імперыі. 4) На аснове народнай мовы візант. эпохі ў 14 ст. пачынае складвацца новагрэч. мова, якой характэрны зніжэнне галосных, монафтангізацыя дыфтонгаў, ператварэнне прыдыхальных зычных у спіранты, замена музычнага націску сілавым, спрашчэнне сістэмы скланення і замена многіх сінт. формаў (асабліва ў сістэме дзеяслова) аналітычнымі канструкцыямі.

Новагрэч. мова карыстаецца без пэўных змен старажытнагрэч. алфавітам (гл. табл. пры арт. *Грэчаскае пісьмо*). Сучасная форма гэтай мовы — дымотыка — ужываецца ў гутарковай мове і ў мастацкай л-ры. Афіц. мова школы і навук. л-ры з 20 ст.— чужая народу «чыстая мова» — кафарэвуса. Яна з'яўляецца штучным набліжэннем да старажытнагрэч. кайнэ, таму моўныя праблемы ў Грэцыі вельмі вострыя. Старажытнагрэч. мова стагоддзямі была важным элементам школьнай і універсітэцкай адукацыі і зрабіла вялікі ўплыў на фарміраванне еўрап. моў, асабліва ўзбагачала лексіку (параўн. інтэрнацыяналізмы: космас, астраномія, матэматыка, фізіка і інш.).

Літ.: Белецкий А. А. Краткий очерк грамматики новогреческого языка, у кн.: Новогреческо-русский словарь, М., 1961; Соболевский С. И. Древнегреческий язык, М., 1948; Лурье С. Я. Язык и культура микенской Греции, М.—Л., 1957; Древнегреческо-русский словарь. Сост. И. Х. Дворецкий, т. 1—2, М., 1958; Русско-новогреческий словарь, М., 1966. *А. І. Харсекін.* Мінск.

ГРЭЧКА (Fagopyrum), род адна-, радзей шматгадовых травяністых раслін сям. грэчкавых. Паходзіць з Азіі. Вядома 4 віды, пашыраныя ў краінах умеранага клімату. Найб. гаспадарчае значэнне мае Г. пасяўнай (F. sagittatum), якая ўведзена ў культуру 4 тыс. гадоў назад як важная крупяная расліна. Вырошчваецца ў СССР (Украіна, Беларусь, Еўрап. частка РСФСР, Забайкалле, Д. Усход), Францыі, ЗША, Канадзе, Польшчы і інш.


Грэчка пасяўная.

Сцябло галінастае, рабрыстае, чырванаватае, выш. 15—100 см. Лісце сэрцападобна-трохкутнае або стрэлападобнае. Кветкі ружовыя або ружова-белыя, чырвоныя, духмяныя. Суквецце — гронка. Плод — трохгранны арэшак. Зерне Г. мае 10—12% лёгказасваяльнага бялку, 60—80 крухмалу, 2,5—3% тлушчу, мінер. солі, арган. к-ты, вітаміны B_1, B_2, PP, P. На Беларусі пашыраны сарты: Юбілейная 2, Цярахоўская мясцовая. Ураджаі дасягаюць 15,4 ц/га (калгас «Іскра» Чэрвеньскага р-на, 1970). Найлепшыя глебы пад Г.— супесчаныя, лёгкія і сярэднія суглінкавыя. У севазваротах ле высяваюць пасля зернебабовых, прапашных і ўгноеных азімых культур. Аптымальны тэрмін сяўбы — 3-я дэкада мая, найлепшы спосаб — шырокарадковы. Вегет. перыяд 65—90 дзён. Г. добры медаонос.

Літ.: Анохин А. Н. Как получать высокие урожаи гречихи в БССР, Мн., 1960; Анохин А. Н. и Горина Е. Д. Крупяные культуры, Мн., 1968.

ГРЭЧКА Андрэй Антонавіч [н. 4(17).10.1903, с. Галадаеўка Таганрогскай акр.], савецкі ваенны дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1955), Герой Сав. Саюза (1958), Герой ЧССР (1969). З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1941). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны, вызвалення Зах.



Беларусі (1939). У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Паўд., 1-м і 4-м Укр. франтах: камандзір дывізіі, корпуса, нам. камандуючага фронту, камандуючы войск арміі. Удзельнік абароны Данбаса і Паўн. Каўказа, баёў на Новарасійскім і Туапсінскім напрамках, вызвалення Правабярэжнай Украіны, аперацый Львоўска-Сандамірскай, Ужгарадскай, Мараўска-Астраўскай, Пражскай. З 1945 камандуючы войск Кіеўскай ваен. акругі; з 1953 галоўнакамандуючы Групы сав. войск у Германіі. У 1957—60 першы нам. міністра абароны СССР, галоўнакамандуючы сухапутных войск. З крас. 1960 адначасова галоўнакамандуючы Аб'яднаных узбр. сіл краін Варшаўскага дагавору; з крас. 1967 міністр абароны СССР. На XIX, XX з'ездах КПСС выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XXII—XXIV — чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—8-га скл. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, 9 інш. ордэнамі, медалямі, Ганаровай зброяй, ордэнамі замежных краін.

Тв.: Битва за Кавказ, 2 изд., М., 1969; Через Карпаты, М., 1970.

ГУАМ (Guam), каланіяльнае ўладанне ЗША на аднайменным в-ве з групы Марыянскіх у зах. ч. Ціхага ак. Пл. 533 *км²*, нас. 102 тыс. чал. (1969), каля паловы складаюць мясцовыя жыхары — народ чамора. Есць таксама амерыканцы, філіпінцы, японцы, кітайцы. Адм. ц. Аганнья. На Пд в-ва — вулканічнае плато, на Пн — раўніна з каралавых вапнякоў. Клімат трапічны пасатны. Ападкаў больш за 2000 *мм* за год. Вырошчваюць какосавую пальму, рыс, каву, цукр. трыснёг. Рыбалоўства. Вялікая ваен. база ЗША.

ГУАНА (ісп. guano), прадукт натуральнага распаду птушынага памёту ў сухім клімаце. Мае каля 9% азоту, 13% фосфарнай к-ты, калій, вапну. Залежы Г. на а-вах зах. ўзбярэжжа Паўд. Амерыкі і Паўд. Афрыкі. Выкарыст. як азотнае і фосфарнае ўгнаенне.

ГУАНДУН, правінцыя на Пд Кітая, на ўзбярэжжы Паўднёва-Кітайскага мора. Пл. 231,4 тыс. *км²*, нас. 40 млн. чал. (1967—68, ацэнка). Адм. ц. Гуанчжоў (Кантон).

Тэр. занята пераважна невысокімі гарамі (да 1922 *м*), каля ўзбярэжжа — невял. нізіны і ўзгорыстыя раёны. Клімат субтрапічны, т-ра паветра каля 14 °С у студз., каля 25 °С у ліп. Ападкаў 1500 *мм* за год. Вырошчваюць рыс, цукр. трыснёг, садавіну (бананы, цытрусавыя), батат, чай, каву, какаву, джут, рамі, бавоўнік, каўчуканосы, тытунь. Шаўкаводства. Гадуюць буйвалаў, свіней, птушак. Рыбалоўства і марскі промысел. Здабыча вугалю, вальфраму, жал. руды, марганцу. Прамысловасць харчовая, папяровая, тэкстыльная. Маст. промыслы. Праз Г. праходзіць пераважная частка замежнага гандлю Кітая. Цесныя эканам. сувязі з англ. калоніяй Сінгапур і партугальскай Аамынь.

ГУАНСІ-ЧЖУАНСКІ АЎТАНОМНЫ РАЁН, на Пд Кітая. Пл. 220 тыс. *км²*, нас. 23 млн. чал. (1967—68, ацэнка) — кітайцы і чжуаны. Адм. ц. Наньнін.

Тэр. занята горамі сярэдняй вышыні (да 2105 *м*), ёсць шырокія міжгорныя даліны, узгорыстыя прасторы. Клімат субтрапічны. Т-ра паветра ад 12 °С у студз. да 28 °С у ліп. Ападкаў каля 1500 *мм* за год. Вырошчваюць рыс (2—3 ураджаі на год), кукурузу, пшаніцу, гаалян, батат, арахіс, кунжут, тытунь, цукр. трыснёг, чайны куст, тунгавае і какававае дрэвы, каўчуканосы, бавоўнік, сізаль. Садоўніцтва (бананы, цытрусавыя). Гадуюць свіней, буйвалаў, коней, коз. Здабыча волава. Вытв. тунгавага і анісавага алею, цукру, тытуню, паперы. Тэкст. і гарбарная прамысловасць. Гал. транспарт — рачны і чыгуначны. Праходзіць чыгунка у В'етнам.

ГУАНЧЖОЎ (Кантон), горад на Пд Кітая. Адм. ц. правінцыі Гуандун. Порт на адным з рукавоў дэльты р. Сіцзян. Чыг. вузел. Аэрапорт. 2 млн. ж. (1960). Пераважае шаўковая прамысл. Прадпр. папяровай (найбольшы ў краіне папярова-цэлюлозны камбінат), гумавай, гарбарна-абутковай, хім., маш.-буд., харч., металаапр., суднабуд., суднарамонтнай, цэментнай, паліграфічнай, дрэваапр. прамысловасці. Пашырана саматужніцтва (вытв. лакіраваных вырабаў, веераў, парасонаў, вырабаў з шоўку і косці). Значны культ. цэнтр Кітая: ун-т з б-кай, абсерваторыяй і бат. садам; політэхнічны, мед., пед., адм.-пед., тэхналагічны, фінансава-эканам. і інш. ін-ты. Музеі.

ГУАНЬ ХАНЬ-ЦЫН (г. н. і см. невяд.), кітайскі драматург і паэт 13 ст., адзін са стваральнікаў жанру чатырохактовай муз. драмы цзацзюй (юаньская драма). Напісаў болей за 60 п'ес, абераглося 18 (сац. драмы «Крыўда Доў Э», «Лу Чжай-лан», камедыі «Уратаванне няшчаснай», «У альтанцы над рэчкаю», гістар. драма «Адзін у стане ворагаў»). У п'есах выкрываў разбэшчаных чыноўнікаў і несправядлівых суддзяў, абараняў годнасць жанчыны, спачуваў абяздоленым. Абераглося і каля 50 лірыч. вершаў і песень.

Тв.: Рус. пер. у кн.: Юаньская драма, Л.—М., 1966.

Літ.: Федоренко Н. Т. Гуань Хань-цин — великий драматург Китая, М., 1958.

ГУАШ (франц. gouache, ад італьян. guazzo вадзяная фарба), непразрыстыя фарбы, расцёртыя ў вадзе з клеем і прымессю бяліл; таксама жывапіс гэтымі фарбамі. Гуашавыя фарбы бліскія да мяккіх гатункаў акварэлі. Малююць Г. на паперы і шоўку, часам у спалучэнні з акварэллю. Фарбы кладуць густым непразрыстым слоем.

Літ.: Киплик Д. И. Техника живописи, [6 изд.], М.—Л., 1950.

ГУАЯКІЛЬ (Guayaquil), самы вялікі горад Эквадора, цэнтр правінцыі. Размешчаны на прыморскай вільготнай раўніне ў ніжнім цячэнні р. Даўле. Гал. порт, вузел чыгунак і шашэйных дарог. Міжнар. аэрапорт. 739 тыс. ж. (1969). Прамысл. і гандл. цэнтр краіны. Мукамольныя, цукр., кансервавыя, вінаробныя, гарбарна-абутковыя, лесапільныя, металаапр. прадпрыемствы. Нафтаперапрацоўка. Ун-т. Г. заснаваны ў 1537.

ГУБА (бярозавы грыб), шматгадовая бясплодная форма грыба Inonotus obliquus сям. губавых грыбоў. Памерам да 20 *см*, мае выгляд няправільнага шурпатага нарасту або наплыву з няроўнай чорнай з трэшчынамі паверхняй. Унутраная тканка цвёрдая, жоўта-бурая. Звычайна Г. вырастае на ствалах бярозы, радзей на алешыне, рабіне. Лекавы прэпарат з Г. бефунгін.



Літ.: Комплексное изучение физиологически активных веществ низших растений, М.— Л., 1961; Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968; Чага и ее лечебное применение при раке IV стадии, Л., 1959.

ГУБАВЫЯ ГРЫБЫ (Polyporaceae), сям. базідыяльных грыбоў. Вядома больш за 1500 відаў, пашыраных на ўсіх мацерыках, акрамя Антарктыды. У СССР 500 відаў, на Беларусі 180.

Пладовыя целы розныя формы: распасцёртыя на субстраце або паліца- і капытападобныя нарасты на драўніне, радзей шапкавыя з ножкаю; кансістэнцыі скурастая, дзераўністая, коркападобная. Гіменафор (выступы на ніжнім баку шапкі) трубчасты, лабірынтавы ці пласціністы. Растуць Г. г. на адмерлых (сапрафіты) або на жывых (паразіты) дрэвах, пнях, зрэдку на глебе. Найб. пашыраныя Г. г.— паразіты дрэўных парод — несапраўдная асінавая губка (Phellinus tremula), карапёвая губка (Fomes annosus), хваёвая губка (Phellinus pini), несапраўдная губка (Phellinus igniarius) і інш. Есць Г. г. ядомыя: бляк (Scutiger ovinus), пяточначніца звычайная (Fistulina hepatica), серна-жоўтая губка (Laetiporus sulphureus); лекавыя — *губа*.



Несапраўдная губка.

Літ.: Гл. пры арт. *Грыбы*.

ГУБАРЭВІЧ Кастусь [Канстанцін Лявонавіч; н. 23.12.1906 (5.1.1907), в. Радучы Чавускага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі драматург. Засл. дз. маст. БССР (1966). З сялян. Скончыў Маскоўскі кінаінстытут (1932). Працаваў на кінастудыі «Савецкая Беларусь» (1932—41), у Айч. вайну — на радыё (бел. радыёстанцыя, Масква), пасля вайны — на Бел. радыё ў Мінску, у газ. «Літаратура і мастацтва», у Міп-ве культуры БССР. Друкуецца з 1926. Першы зб. апавяд. «Гайда туды і Жывыя шрубы» (1930). Аўтар п'ес пра станаўленне Сав. улады на Беларусі («Галоўная стаўка», 1957), гераізм сав. людзей у Айч. вайну («Брэсцкая крэпасць», 1952, новая рэд. «Людзі і камяні», 1969; «Цэнтральны ход», з І. Дорскім, паст. 1948; «Першы ўрок», 1968), пра бел. эмігрантаў і радасць іх вяртання на радзіму («Далёкая песня», 1961), жыццё калгаснай вёскі («Алазанская даліна», з Дорскім, паст. 1949; «На крутым павароце», 1956; «А куды ж нам падзецца?», 1963) і маладых рабочых («Простая дзяўчына», 1953). Услаўляе героіку барацьбы і патхнёнай працы нашага сучасніка. П'есы Г. ставілі т-р імя Я. Купалы, т-р імя Я. Коласа, Брэсцкі т-р імя ЛКСМБ, Рускі драм. т-р БССР і інш. т-ры СССР. Аўтар («Анюціна дарога», 1968; «Паланез Агінскага», 1971) і сааўтар сцэнарыяў фільмаў («Баям насустрач», 1932; «Фарпост вялікай Радзімы», 1936; «Савецкая Беларусь», 1951; «Дзяўчынка шукае бацьку», 1959). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: П'есы, Мн., 1954; П'есы, Мн., 1963; П'есы, Мн., 1969; Роднае, дарагое, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Пашкевіч Н. Тры п'есы, «Полымя», 1955, № 1; Волчецкий Л. Пятьсот встреч, «Неман», 1961, № 3; Нядзведзь У. Беларускі тэатр, Мн., 1959, с. 310—312, 317—320, 345—346; Усікаў Я. Сталасць драматурга, «Полымя», 1964, № 6; Ватацы Н. Б. Беларуская савецкая драматургія. Бібліяграфія, Мн., 1967, с. 55—61.

Я. К. Усікаў. Магілёў.

ГУБАРЭВІЧ Якаў Рыгоравіч [н. 20.11(3.12). 1905, г. Рагачоў Магілёўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1952), праф. (1953). Чл. КПСС з 1950. Скончыў Ленінградскі вет. ін-т (1932). Заг. кафедры акушэрства Кіргізскага зоавет. ін-та (1937—38) і Ленінградскага ін-та ўдасканалення вет. урачоў (1938—41, 1946—59). Удзельнік Айч. вайны. З 1959 заг. кафедры акушэрства, гінекалогіі і штучнага асямянення Віцебскага вет. ін-та. Асн. працы па вет. гінекалогіі, акушэрстве і штучным асямяненні. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Акушерство мелких животных, 2 изд., М.—Л., 1952; Ветеринарное акушерство и гинекология, 4 изд., М.—Л., 1960; (у сааўт.) Акушерство, гинекология и искусственное осеменение сельскохозяйственных животных, Л., 1967.

ГУБАСЦІК (Mimulus), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. залознікавых. Вядома каля 60 відаў, пашыраных пераважна ў петрапічнай Амерыцы. У СССР 6 відаў, на Беларусі адзін — Г. рабы (M. guttatus).



Губасцік рабы.

Голыя ці апушаныя, іншы раз ліпкія расліны з прамастойным або распасцёртым сцяблом, вышынёй (даўж.) да 1 *м*. Лісце супраціўнае, цэласнае, зубчастае, зрэдку лопасцевае. Кветкі адзіночныя, у пазухах лісця сінія, чырвоныя або светла-жоўтыя з крапінкамі. Суквецце — рыхлая гронка. Плод — двухгнёздавая каробачка. Г. рабы расце на вільготных месцах, па берагах рэк, ручаёў, па канавах, на балотах. Вырошчваецца як дэкар. расліна.

Літ.: Флора СССР, т. 22, М.—Л., 1955.

В. М. Прусакова. Мінск.

ГУБЕР Аляксандр Андрэевіч [19.3(1.4). 1902, с. Каменка Чыгірынскага пав. Кіеўскай губ.— 16.6.1971], савецкі гісторык. Акад. АН СССР (1966), д-р гістар. н. (1943). Чл. КПСС з 1952. Вывучаў гісторыю краін Паўд.-Усх. Азіі, асабліва Інданезіі, Філіпін, В'етнама. Г. належаць таксама працы па агульных пытаннях нац.-вызв. руху калан. народаў, па міжнар. адносінах, па гісторыі ўсходазнаўства і інш. Выкладаў у Маскоўскім ун-це (з 1937), у Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (з 1946), узначальваў Ін-т усходазнаўства АН СССР. Чл. Сав. камітэта абароны міру (з 1955) і Сав. камітэта салідарнасці краін Азіі і Афрыкі (з 1956). 15.8.1970 выбраны прэзідэнтам Міжнар. камітэта гістар. навук. Узнаг. 2 ордэнамі Працоўн. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Индонезия. Социально-экономические очерки, М.—Л., 1932; Филиппины, М., 1937; (разам з О. К. Рыкоўскай) Хосе Ризаль, М., 1937; Филиппинская республика 1898 года и американский империализм, 2 изд., М., 1961; Мужество Вьетнама, М., 1968.

Літ.: Александр Андреевич Губер (К 60-летию со дня рождения), «Народы Азии и Африки», 1962, № 2; Основные труды Г., там жа.

«ГУБЕРНСКІЕ ВЕДОМОСТІ», назва афіцыйных газет, якія выдаваліся ў Расіі з 1838 да 1917 пад наглядам і кіраўніцтвам губернскіх улад у губернях і абласцях (абласныя ведамасці). З'яўляліся праваднікамі самадзяржаўнай палітыкі рус. царызму.

У 1838 «Г. в.» выходзілі ў 42 губ. Выдаваліся 2—3 разы на тыдзень або штодзённа. Мелі 2 часткі: афіцыйную, у якой публікаваліся пастановы і загады цэнтр. і мясцовых улад, і неафіцыйную — друкаваліся звесткі пра здарэнні, з'явы прыроды, с. гасп., прамысловасць, навуч. ўстановы, аб'явы і інш. У «Г. в.» забараняліся артыкулы на палітэмы, фельетоны і гумарыстычны матэрыял. У канцы 19 — пач. 20 ст. мясц. ўлады ў сувязі з ростам рэвалюц. руху ў Расіі вымушаны былі пашыраць праграму «Г. в.»: больш шырока стала асвятляцца мясц. жыццё, паяўляюцца гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы. Аднак «Г. в.» так і не набылі папулярнасці, распаўсюджваліся звычайна па абавязковай падпісцы.

На Беларусі выходзілі: *«Витебские губернские ведомости»* (1838—1917, Віцебск), *«Гродненские губернские ведомости»* (1838—1915, Гродна), *«Минские губернские ведомости»* (1838—1917, Мінск), *«Могилёвские губернские ведомости»* (1838—1917, Магілёў). Бел. матэрыялы друкаваліся таксама ў *«Виленских губернских ведомостях»* (1838—1916, Вільня, Дзісна, Тула).

ГУБЕРНСКІЯ ВУЧОНЫЯ АРХІЎНЫЯ КАМІСІІ, паўафіцыйныя архіўныя ўстановы ў Расіі, адначасова і мясцовыя гістар. таварыствы.

Утвораны паводле «Палажэння пра губернскія гістарычныя архівы і вучоныя архіўныя камісіі» ад 13.4.1884. Мелі на мэце стварэнне гістар. архіваў і прагляд ва установах дакументаў, што падлягалі знішчэнню. Камісіі абіралі гістар. дакументы, кнігі, этнагр. і фальклорныя матэрыялы, вялі археал. раскопкі, выдавалі «Працы», «Весці», «Зборнікі». Да 1917 створана 41 камісія, у т. л. на Беларусі *Віцебская вучоная архіўная камісія*. Скасаваны ў сувязі з архіўнай рэформай паводле дэкрэта СНК РСФСР ад 1.6.1918.

Літ.: Труды первого съезда представителей губернских ученых архивных комиссий..., СПб., 1914; Гессен Ю. Из жизни архивных комиссий, у кн.: Сборник материалов и статей, в. 1, М., 1921; Шведова О. И. Указатель «Трудов» губернских ученых архивных комиссий и отдельных их изданий, у кн.: Археографический ежегодник за 1957 г., М., 1958.
Э. М. Савіцкі Мінск.

ГУБЕРНІЯ (ад лац. gubernator правіцель), адм.-тэр. адзінка ў Расіі 1708—1929. Уведзена Пятром I.

У 1708 тэр. Расіі падзелена на 8 Г., у 1725 на 14. Г. дзяліліся на правінцыі і дыстрыкты, з 1775 на паветы ці акругі; 2—3 Г. складалі намесніцтва, з 1775 — генерал-губернатарства. На канец царавання Кацярыны II была 51 Г., у пач. 20 ст. 101. Узначальваў Г. губернатар, падпарадкаваны сенату і пракурорскаму нагляду. Выконваўчыя органы — спачатку губернскае праўленне і земскі суд. Пасля скасавання прыгону апарат губ. кіравання складаўся з губ. праўлення, галіновых канцылярый (земскіх, гарадскіх, судова-адм., вайскова-адм., грашовых і інш.) і галіновых устаноў (казённыя палаты, губ. статыстычныя к-ты і інш.).

Беларусь падзелена на Г. пасля ўз'яднання з Расіяй. Паводле ўказа Сената ад 23.10.1772 Віцебскае, Інфлянцкае, Мсціслаўскае і Полацкае ваяводствы аб'яднаны ў *Магілёўскую губернію* і Пскоўскую. У 1776 з бел. паветаў Пскоўскай губ. ўтворана *Полацкая губернія*. На тэр. Беларусі, уз'яднанай з Расіяй пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай, у маі 1795 утворана *Мінская губернія*, пасля 3-га падзелу — *Слонімская губернія*. Браслаўскі і Ашмянскі пав. ўключаны ў *Віленскую губернію*. У 1796 Магілёўская і Полацкая губ. аб'яднаны ў *Беларускую губернію*, Слонімская і Віленская — у *Літоўскую губернію*, да Мінскай далучаны Рэчыцкі пав. Чарнігаўскай губерні. У 1802 Беларуская губ. падзелена на *Віцебскую губернію* і Магілёўскую, Літоўская — на *Гродзенскую губернію* і Віленскую; Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Дзісенскі і Лідскі пав. ўвайшлі ў Віленскую губ. Пасля Кастр. рэв. спачатку стары адм. падзел астаўся, але бурж. бюракратычны апарат быў заменены Саветамі рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У ходзе рэвалюцыі ўзнікла новая адм. адзінка — *вобласць*. *Заходняя вобласць* аб'ядноўвала Віцебскую, Мінскую, Магілёўскую губ. і неакупаваныя немцамі паветы Віленскай. У 1918 у Заходнюю вобл. уключана Смаленская губ. 26.5.1919 утворана *Гомельская губернія*. У 1924 у выніку новай адм.-тэр. рэформы Г. ў БССР ліквідаваны (гл. *Акруга*). У РСФСР падзел на Г. існаваў да 1929.

Літ.: Круталевич В. А. Административно-территориальное устройство БССР, Мн., 1966; Ерошкин Н. П. Очерки истории государственных учреждений дореволюционной России, М., 1960; Нелидов А. Л. История государственных учреждений СССР 1917—1936 гг., М., 1962; Готье Ю. В. История областного управления в России от Петра I до Екатерины II, т. 1—2, М.—Л., 1913—41.
Э. М. Савіцкі. Мінск.

ГУБІНА, вёска ў Каменскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны сцяг». За 25 *км* на ПнУ ад Лепеля, 92 *км* ад Віцебска, каля шашы Лепель — г. п. Ула (1 *км*). 152 ж., гасп. 53 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка.

ГУБІНКА, вёска ў Жытамлянскім с/с Гродзенскага р-на, на р. Пыранка. Цэнтр калгаса «Савецкая Беларусь». За 25 *км* на ПдУ ад Гродна, 7 *км* ад чыг. ст. Жыдомля. 142 ж., гасп. 41 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ГУБІЧЫ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Энгельса. За 20 *км* на З ад Буда-Кашалёва, 45 *км* ад Гомеля, 8 *км* ад чыг. ст. Шарыбаўка, 15 *км* ад прыстані Стрэшын на Дняпры, на шашы Гомель — Жлобін, 5 *км* ад Дняпра. 561 ж., двароў 206 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле 103 сав. воінаў, якія загінулі пры вызваленні Г. ад ням.-фаш. захопнікаў.

ГУБКІ (Spongia, Porifera), тып прасцейшых шматклетачных беспазваночных. Вядома каля 5 тыс. відаў. Жывуць пераважна ў морах і акіянах, толькі каля 10 відаў у прэснай вадзе. У вадаёмах Беларусі з Г. водзіцца *бадзяга*.



Губка конскі Венеры.

Асобныя Г. маюць гарлачыкападобную або цыліндрычную форму, выш. 2—3 *см*, адным канцом прымацоўваюцца да субстрату, на другім адтуліна — вусце. Сценкі цела з порамі, праз якія праходзіць вада з прадуктамі жыўлення. Шкілет з ваністых і крамянёмных іголак або з рагападобнага рэчыва. Размнажаюцца полавым спосабам і пачкаваннем. Усе Г. здольныя да рэгенерацыі і могуць узнаўляць арганізм з некалькіх клетак. Большасць Г. утварае калоніі, іншы раз да 1,5 *м* выш. Прамысл. значэнне маюць туалетныя Г. з атр. крамянёварагавых (Spongia officinalis, Hippospongia communis і інш.), якія выкарыстоўваюцца ў медыцыне і тэхніцы, шкляныя Г. (конскі Венеры, гіпланема) ідуць на ўпрыгожанні і сувеніры.

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

ГУБКІН Іван Міхайлавіч [9(21).9.1871, в. Пазнякова Мурамскага пав. Уладзімірскай губ.— 21.4.1939], савецкі вучоны ў галіне геалогіі і горнай справы. Акад. АН СССР (1929). Чл. КПСС з 1921. Скончыў Пецярбургскі горны ін-т (1910). З 1918 узначальваў розныя цэнтр. ўстановы горнагеал. службы краіны. З 1920 праф., а з 1922 рэктар Маск. горнай акадэміі. З 1930 кіраваў Маск. нафтавым ін-там, створаным па яго ініцыятыве. У 1936 віцэ-прэзідэнт АН СССР. Распрацаваў навук. асновы тэорыі паходжання нафты і ўмоў утварэння яе радовішчаў. Абгрунтаваў і ўкараніў геафіз. метады разведкі Курскай магн. анамаліі. Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Яго імем названы Маскоўскі ін-т нафта-хімічнай і газавай прамысловасці.



Тв.: Избранные соч., т. 1—2, М.—Л., 1950—53.
Літ.: Кумок Я. Н., Губкин, М., 1968 (Жизнь замечательных людей).

ГУБКІН Сяргей Іванавіч [15(27).8.1898, Пецярбург — 8.9.1955], беларускі савецкі вучоны ў галіне механікі пластычнасці і апрацоўкі металаў ціскам. Акад. АН БССР (1947), праф. (1945), засл. дз. нав. і тэхн. БССР (1954). Сын І. М. *Губкіна*. Скончыў Маскоўскую горную акадэмію (1922). У 1944—48 нам. дырэктара Ін-та металургіі АН СССР. У 1948—50 дырэктар Ін-та фіз.-матэм. і тэхн. навук АН БССР, у 1950—55 — Фіз.-тэхн. ін-та АН БССР. Навук. працы па тэорыі пластычнай дэфармацыі і апрацоўцы металаў ціскам. Заснавальнік бел. навук. школы апрацоўкі металаў ціскам. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Тв.: Теория течения металлического вещества, М.—Л., 1935; Теория обработки металлов давлением, М., 1947; (разам з С. І. Дабравольскім і В. Б. Войка) Фотопластичность, Мн., 1957; Пластическая деформация металлов, т. 1—3, М., 1961.

ГУГЕЛЬ Адольф Самойлавіч (н. 3.6.1915, Вена), беларускі савецкі мастак. Чл. КПСС з 1943. Вучыўся ў Віцебскім маст. тэхнікуме (1936—40). Асн. тэма творчасці — падзеі Кастр. рэвалюцыі і Вял. Айч. вайны. Сярод работ: «Ідуць на фронт» (1943), «Важнае паведамленне» (1949), «Чарнышэўскі і Дабралюбаў у рэдакцыі часопіса «Современник» (1950), «З мінулага» (1957), «У. І. Ленін і Н. К. Крупская ў Горках» (1964), «Ленін сярод сялян» (1965), «Ленін сярод параненых чырвонаармейцаў» (1967). У сааўтарстве з Р. Кудрэвіч: «Кастусь Каліноўскі» (1950), «М. Астроўскі» (1956), «Апасіяната» (1963), трыпціх «Сімфонія рэвалюцыі» («Царская Расія», «Апасіяната», «Новае жыццё», 1968), «Грэнада» (1970). У Дзярж. маст. музеі БССР 28 работ мастака. Іл. глядзі на ўклейцы да арт. *Гістарычны жанр*.

Літ.: Выстаўка твораў мастака А. С. Гугеля, прысвечаная 50-годдзю з дня нараджэння. Каталог, Мн., 1965.

ГУГЕНОТЫ (франц. huguenots, магчыма, ад ням. Eidgenossen саюзнікі), прыхільнікі кальвінісцкай (пратэстанцкай) рэлігіі ў Францыі 16—18 ст.

Г. былі прадстаўнікамі буржуазіі, плебейства, што пратэставалі супраць феад. эксплуатацыі, а таксама часткі дваранства і феад. знаці, якая змагалася з каралеўскім абсалютызмам. Супярэчнасці паміж католікамі і Г. выклікалі т. зв. *рэлігійныя войны*. Паводле Нантскага эдыкту 1598 Г. атрымалі свабоду веравызнання і некаторую палітэмы былі паступова знішчаны (Нантскі эдыкт скасаваны ў 1685). Толькі ў час франц. бурж. рэвалюцыі 18 ст. Г. атрымалі аднолькавыя правы з католікамі. Гл. таксама *Варфаламееўская ноч*.

ГУДАГАЙ, пасёлак і чыг. ст. ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 4 *км* на ПдЗ ад Астраўца, 246 *км* ад Гродна. 1077 ж., гасп. 326 (1971). Раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, майстэрня быткамбіната. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 4 магазіны. Помнік на брацкай магіле 95 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГУДАЎ Павел Пятровіч (н. ў студз. 1902, в. Нова-Высокая Мазырскага пав. Мінскай губ.), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1925. Скончыў Бабруйскую саўпартшколу (1923), камуніст. ун-т (1931). Напярэдадні Айч. вайны у Гомельскім абкоме КП(б)Б. З лют. 1943 у партызанах, з крас. 1943 палітрук, з чэрв. 1943 камісар партыз. атрада. З 1943 камісар *партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі* Васілевіцкага р-на Палескай вобл., адначасова сакратар Васілевіцкага падпольнага РК КП(б)Б.

ГУДЗЕВІЧЫ (Гудзявічы), вёска ў Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Верацейкі. Цэнтр сельсавета і калгаса «Гудзевічы». За 32 *км* на З ад Мастоў, 60 *км* ад Гродна, 20 *км* ад чыг. ст. Рось. 201 ж., гасп. 63 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. У час Айч. вайны 1812 каля Г. адбыўся бой казакоў Платава з перадавымі атрадамі Жэрома Банапарта. Помнік-абеліск 38 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ГУДЗІМАЎ Барыс Сяргеевіч (12.12.1919, в. Калыён Шчаглоўскага пав. Томскай губ.),

беларускі савецкі вучоны ў галіне хірургіі. Д-р мед. н. (1965), праф. (1967). Чл. КПСС з 1946. Скончыў Новасібірскі мед. ін-т (1942). У 1942—47 у Сав. Арміі. Займаўся практычнай, навук. і пед. дзейнасцю ў Новасібірску (1948—60). Заг. кафедры шпітальнай хірургіі Акцюбінскага (1961—63), Чыцінскага (1963—69), Гродзенскага (з 1969) мед. ін-таў. Асн. даследаванні па распрацоўцы камбінаваных спосабаў унутрыкасцявой анестэзіі і шляхоў паляшэння смяротнасці ад шоку і пашкоджанняў сасудаў пры аперацыях на печані.

Тв.: О направленном изменении устойчивости организма к шокогенной травме при резекции печени, Чита, 1966; Пути снижения летальности от шока при операциях на печени, Чита, 1966; Последствия ранения сосудов при операциях на печени, их профилактика и лечение, Чита, 1966.


ГУДЗІМАЎ Сцяпан Мітрафанавіч [25.10 (7.11).1913, с. Ягаднае Царыцынскага пав. Саратаўскай губ.— 22.6.1941], лётчык-знішчальнік, адзін з першых у Айч. вайну зрабіў паветраны таран. Чл. КПСС з 1941. З мая 1938 лейтэнант Г. на Беларусі, штурман эскадрыллі 33-га знішчальнага палка. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). 22.6.1941 у 5 гадзін раніцы над Пружанамі са сваёй эскадрылляй уступіў у паветр. бой з ворагам. Збіў 1 бамбардзіроўшчык, другі тараніў і загінуў сам.

ГУДЗО́НАЎ ЗАЛІЎ (Hudson Bay), заліў Паўн. Ледавітага ак. Глыбока ўразаецца ў мацярык Паўн. Амерыкі. Злучаецца з Атлантычным ак. Гудзонавым пралівам. Пл. 819 тыс. *км*². Глыб. да 301 *м*. Т-ра вады на паверхні зімой ніжэй за 0, летам ад 3 на Пн да 9 °С на Пд. Салёнасць 23—33,3‰. З вер. да ліп. ўкрыты лёдам. Прылівы паўсутачныя, выш. да 7,9 *м*. Асн. порт Чэрчыл.

ГУДЗО́НАЎ ПРАЛІЎ (Hudson Strait), паміж п-вам Лабрадор на Пд і в-вам Бафінава Зямля на Пн, каля паўн.-ўсх. берагоў Паўн. Амерыкі. Злучае Гудзонаў заліў з Атлантычным ак. Даўж. каля 800 *км*, найменшая шыр. 115 *км*, глыб. 200—603 *м*. Суднаходны 4 месяцы, толькі ў верасні чысты ад лёду.

ГУДКО́Ў Мікалай Пятровіч [н. 6(19).12.1912, хутар Сокалава-Кундручаскі Вобл. Войска Данскога], адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1941. З 1938 на сав. рабоце. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40, абароны Віцебска (1941). У партызанах з 14.5.1942. З ліп. 1942 камандзір *партызанскай брыгады імя М. П. Гудкова* Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Пасля вайны ўпаўнаважаны ўрада БССР у Польшчы, на сав. рабоце ў Мінску. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Навашахціпску Растоўскай вобл.

ГУДО́ВІЧ Вільгельм Іосіфавіч (1914, Мінск — 25.12.1943), кіраўнік камсамольска-маладзёжнай падпольнай групы ў *Мінскім камуністычным падполлі* ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. ВЛКСМ. Напярэдадні вайны слесар на паравозарамонтным з-дзе імя Мяснікоску ўзначаліў камсамольска-маладзёжную арг-цыю «Зубілкін» (14 чал.), якая рабіла дыверсіі на паравозарамонтным з-дзе і ст. Мінск-Таварная, вырабляла і перапраўляла партызанам дэталі да зброі, вяла разведку, лячыла раненых партызанаў. У снеж. 1943 арыштаваны, пасля катаванняў расстраляны.



Літ.: Николаев Н. Минские молодогвардейцы, Мн., 1968, с. 66—77.

ГУДО́К, старарускі смыковы музычны інструмент з круглаватым ці грушападобным корпусам, 3 струнамі (на адной выконваецца мелодыя, 2 астатнія — бурдонныя). Улюбёны інструмент скамарохаў. Пра пашырэнне гудошнікаў на Беларусі сведчыць тое, што ў 16 ст. іх абкладалі падаткам (пастанова Віленскага сейма 1565—66).

ГУДО́Н (Houdon) Жан Антуан (20.3.1741, Версаль — 15.7.1828), французскі скульптар. Вучыўся ў Ж. Б. Пігаля і Ж. Б. Лемуана. Надаючы вял. значэнне анатоміі як аснове скульптуры, стварыў «Чалавека з аголенымі мускуламі», які стаў навуч. дапаможнікам многім пакаленням скульптараў. Аўтар партрэтаў Д. Дзідро, К. В. Глюка і інш. У статуі Вальтэра (1781) з асаблівай пераканальнасцю зліваюцца востраяя рэаліст. характарыстыка і класічная ўзвышанасць вобраза.

ГУДРАНА́ТАР, машына для размеркавання бітуму і дзёгцю пры будаўніцтве ці рамонце дарог. Бываюць ручныя, прычапныя, самаходныя (аўтагудранатары). Самаходны Г. мае цеплаізаляваную цыстэрну для вяжучага матэрыялу і сістэму для яго падагрэву, бітумаправоды, помпу, размеркавальныя трубы з сопламі і інш. абсталяванне.

Літ.: Герцог В. А., Васильев П. А. и Кабанов В. В. Современные зарубежные гудронаторы и битумовозы. Обзор, М., 1966.

ГУДРО́Н, смолападобная маса, што астаецца пасля адгонкі з нафты бензінавых, газавых і масляных фракцый.

Складаецца з цяжкіх маслаў, якія не адганяюцца пры перагонцы нафты, нафтавых смолаў, цвёрдых смолападобных рэчываў нейтральнага характару (асфальтэнаў, карбенаў і карбоідаў), смалістых рэчываў кіслотнага характару (асфальтагенавых к-т і іх ангідрыдаў). Шчыльн. Г. 950—1000 *кг/м*³, вязкасць умоўная пры 100 °С ад 18 да 45 адзінак. Ужываецца ў прамысл. вытворчасці нафтавых бітумаў.

ГУДЫ, вёска ў Крупаўскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Радзіма». За 5 *км* на Пн ад Ліды, 116 *км* ад Гродна, 2 *км* ад чыг. ст. Гуды. 128 ж., гасп. 36 (1971). Б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік на брацкай магіле 56 сав. воінаў Айч. вайны.

ГУЗІКАЎ (Гусікаў) Міхаіл Іосіф [2(14).9.1806, Шклоў — 21.10.1837], музыкант, віртуоз-ксілафаніст. Спачатку выступаў як цымбаліст, пазней распрацаваў канструкцыю сучаснага ксілафона. Рэпертуар Г. складаўся пераважна з рус., бел., укр., польск., лўр. нар. песень і танцаў, уласных імправізацый. Гастраляваў у Варшаве, Вене, Берліне, Лейпцызе, Парыжы.


Літ.: Ямпольский И. Первый виртуоз на ксилофоне, «Советская музыка», 1959, № 11.

ГУПКА, рака ў бас. Віліі. Даўж. 19 *км*. Злівается з Вязынкай і ўтварае р. Рыбчанку. Цячэ ў зоне *Віленска-Мінскай воднай сістэмы* на тэр. Мінскага і Маладзечанскага р-наў Мінскай вобл. Вадазбор (98 *км*²) узгорыста-марэнны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. У параўнанні з суседнімі рэкамі сцёк паніжаны. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,5 *м*³/*сек*.

ГУПЧЖОЎ, правінцыя на ПдЗ Кітая. Пл. 174 тыс. *км*². Нас. 17 млн. чал. (1967—68, ацэнка). З іх 60% кітайцаў, 40% складаюць мяа, буі, дун, чжуаны, яа, хуэй. Адм. цэнтр г. *Гуян*.

Правінцыю займае Юньнань-Гуйчжоўскае нагор'е выш. да 2872 *м*, парэзанае глыбокімі рачнымі далінамі. Клімат субтрапічны, вільготны. Рэкі басейнаў Яцзы (на Пн) і Сіцзяна (на Пд). Гал. галіна эканомікі — с. гасп. Асн. культура — рыс (70% збору ўсіх збожжавых культур). Вырошчваюць кукурузу, пшаніцу, ячмень, тытунь, чайны куст, алейныя, батат, гаалян, бавоўнік, цукр. трыснёг, джут, цукр. бурак. Развіта садоўніцтва (цытрусавыя, яблыкі, слівы, грушы). Жывёлагадоўля мае дапаможнае значэнне. Вытв. тунгавага алею, вырошчванне лакавага дрэва, збор лекавых раслін і інш. Здабыча ртуці (1-е месца ў Кітаі), медзі, марганцу, сурмы. Чорная і каляровая металургія. Вытворчасць хім. і электрамех. абсталявання. Прадпр. шкляной, гарбарнай, цементнай, лесапільнай, папяровай, тытунёвай, харч. прамысловасці. Саматужніцтва.

ГУК, механічныя ваганні і хвалі ў пругкіх асяроддзях. У больш вузкім сэнсе Г.— мех. ваганні, якія суб'ектыўна ўспрымаюцца слыхавымі органамі чалавека і жывёл. Даследаваннем Г. займаецца *акустыка*. Крыніца Г.— любы фіз. працэс, які выклікае змену ціску ці мех. напружанняў у асяроддзі. Гэта вядзе да ўтварэння гукавых хваляў, скорасць распаўсюджання якіх залежыць ад пругкасці і шчыльнасці асяроддзя. Г. характарызуецца гучнасцю (сілай) і вышынёй. Першая вызначаецца амплітудай ваганняў крыніцы Г., а другая — частатой. Г. у асяроддзі паглынаецца ў выніку ператварэння энергіі гукавых хваляў у цеплавую ці інш. формы. Гукавыя хвалі шырока выкарыстоўваюцца ў навук. даследаваннях, у тэхніцы і нар. гаспадарцы (гл. *Гідраакустыка, Гідралакацыя, Ультрагукавая апрацоўка*).



Адчувальнасць вуха чалавека розная да Г. рознай частаты (гл. рыс.). Ніжняя крывая адпавядае парогу чутнасці, г. зн. самым слабым Г., якія ўспрымаюцца чалавечым вухам. Парог чутнасці павялічваецца ў вобласці вельмі нізкіх і вельмі высокіх частот. Чалавек не ўспрымае не толькі вельмі слабых, але і вельмі інтэнсіўных Г. (інтэнсіўнасці Г. пры слыхавым успрыманні адпавядае адчуванне гучнасці). Верхняя крывая паказвае інтэнсіўнасць Г., якія выклікаюць адчуванне болю. Паміж крывымі знаходзіцца вобласць гукавых хваляў, якія ўспрымаюцца чалавекам. Чалавечае вуха не рэагуе на Г. з частатою ніжэй за 20 *гц (інфрагукі)* і вышэй за 20 000 *гц (ультрагукі)*.

Літ.: Гл. пры арт. *Акустыка*.

А. С. Шыллей. Мінск.

ГУК (Hooke) Роберт (18.7.1635 — 3.3.1703), англійскі прыродазнавец. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1663). У 1660 адкрыў залежнасць паміж дэфармацыяй цела і мех. напружаннем (гл. *Гука закон*). Пабудаваў першую паветр. помпу. Разам з Х. *Гюйгенсам* вызначыў пастаянныя пункты тэрмометра — пункт растання лёду і пункт кіпення вады. Сканструяваў прыладу для вымярэння сілы ветру, аптычны тэлеграф, машыну для дзялення круга, удасканаліў барометр, люстраны тэлескоп, мікраскоп і інш. прылады. У 1665 апублікаваў працу «Мікраграфія», дзе ўпершыню паказаў клетачную будову корка (увёў тэрмін «клетка»).

Літ.: Райнов Т. И. Роберт Гук и его трактат об экспериментальном методе, у кн.: Научное наследство. Естеств.-научная серия, т. 1, М.— Л., 1948.

ГУК МУЗЫЧНЫ, гук, які мае дакладную вышыню і ўваходзіць у склад пэўнай *гукавой сістэмы*.

ГУКА ЗАКО́Н, паказвае залежнасць паміж механічным напружаннем і дэфармацыяй цела ў межах пругкасці. Адкрыты ў 1660 англ. вучоным Р. *Гукам* (1635—1703). Паводле Г. з. пры падоўжным расцяжэнні (сціскванні) цела даўжынёй l адноснае падаўжэнне (скарачэнне) $\frac{\Delta l}{l}$ прапарцыянальнае прыкладзенаму напружанню: $\sigma = E\frac{\Delta l}{l}$, дзе σ — напружанне, Δl — абс. падаўжэнне (скарачэнне), E — т. зв. модуль Юнга (гл. *Модулі пругкасці*).

ГУКАВА́Я СІСТЭ́МА (музычная сістэма), арганізацыя гукаў па вышыні. Вызначальныя прыкметы пэўнай Г. с.: колькасць гукаў, іх інтэрвальныя суадносіны, дыяпазон (адлегласць паміж самым нізкім і самым высокім гукам). У сучаснай музыцы агульнапрынятая Г. с. з 12 гукаў у межах адной актавы. У кожнай Г. с. існуюць розныя лады.

ГУКАВО́Е КІНО, гл. ў арт. *Кінематограф*.

ГУКАВЫЯ ЗАКО́НЫ, заканамернасці, якія вызначаюць умовы, час і пашыранасць пэўных фанетычных змен у якой-н. мове або ў дыялекце. Гл. *Фанетычныя законы*.

ГУКАЗА́ПІС, запіс гукавых ваганняў на гуканосьбіце для наступнага ўзнаўлення. Пры гэтым гуказапісны элемент (разец, светлавы прамень, магн. поле) пакідае след гукавога вагання *(фанаграму)* на рухомым гуканосьбіце. Энергія гуку ператвараецца мікрафонам у эл. энергію, якая пасля ўзмацнення прыводзіць у дзеянне гуказапісны элемент. Г. карыстаюцца пры вырабе грамафонных пласцінак, у гукавым кіно і інш. Гл. таксама *Гуказдымальнік, Магнітны гуказапіс, Механічны гуказапіс, Стэрафанічны гуказапіс*.

ГУКАЗДЫМА́ЛЬНІК, адаптэр (англ. adapter), прылада для электраакустычнага

ўзнаўленне механічнага запісу гуку. Пераўтварае мех. ваганні ў ваганні эл. напружання. Г. бываюць электрамагнітныя, электрадынамічныя і п'езаэлектрычныя.

ГУКАІЗАЛЯЦЫЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, эластычныя ці пористыя матэрыялы для гашэння шумаў і вібрацый. Ужываюцца як пракладкі і праслойкі ў перакрыццях, сценах будынкаў, фундаментах машын, гукаізаляцыйных кажухах і інш. Г. м.— азбестацэментавыя, драўняшпавалакністыя і мінераловатныя пліты, гума, шкломатэрыялы, перлітавыя і фібралітавыя пліты і інш.

Літ.: Борьба с шумом, под ред. Е. Я. Юдина, М., 1964; Звукопоглощающие и звукоизоляционные материалы, под ред. Е. Я. Юдина, М., 1966.

ГУКАПЕРАПМАННЕ, 1) у мовазнаўстве — умоўнае ўзнаўленне гукаў прыроды, крыкаў жывых істот, а таксама стварэнне слоў, гукавыя абалонкі якіх у пэўнай ступені нагадваюць названыя прадметы і з'явы. Напр.: «ха-ха-ха», «ціў-ціў», «трэсь», «ба-бах», «дзын-дзын», «кукарэкаць», «кукаваць» і інш. 2) У паэтычнай мове — від літаратурнага гукапісу, імітацыя гукавых асаблівасцей рэальных з'яў (шуму дажджу, грукату грому, стукату конскіх капытоў і інш.). Напр., паўтарэннем гукаў «р», «к», «т» М. Танк у вершы «Вадаспад Адама Міцкевіча» імітуе рокат горнага вадаспаду: «Даліна горная Растока, крутыя Татры, буралом, дзе, быццам крэсівам, патокі з круч высякаюць іскры, гром».

ГУКАРАД, паслядоўна размешчаныя па вышыні ўсе ўжываныя ў музыцы гукі ці гукі пэўнай гукавой сістэмы, ладу, мелодыі або музычнага інструмента.

ГУКІ МОВЫ, найдрабнейшыя непадзельныя адзінкі вуснай мовы. У анатама-фізіял. плане адрозніваюцца вышынёю, тэмбрам і сілаю. Падзяляюцца на *галосныя гукі* і *зычныя гукі*. Гукі складаюць матэрыяльную абалонку слова, у функцыянальным плане аб'ядноўваюцца ў *фанемы*.

ГУЛА, старадаўняя народная гульня з цяжкімі прадметамі (ядро ці кола воза). Гл. *Беларускія народныя гульні*.

ГУЛАЕЎ Мікалай Дзмітрыевіч (н. 26.2.1918, станіца Аксайская Данской вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Двойчы Герой Сав. Саюза (1943, 1944). Ген.-л.-авіяцыі (1968). З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію (1950), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1960). У Чырв. Арміі з 1938. У Айч. вайну на Сталінградскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Укр. франтах. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Белгарадам, на Арлоўска-Курскай дузе, вызваленні Беларусі, Польшчы, Чэхаславакіі. Зрабіў 240 баявых палётаў, правёў 69 паветр. баёў, збіў 57 варожых самалётаў. Пасля вайны — у войсках ППА.

ГУЛАК-АРЦЯМОЎСКІ Пятро Пятровіч [10(23).11.1766, с. Гарадзішча Чаркаскага пав. Кіеўскай губ.— 1(13).10.1885], украінскі пісьменнік. Скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію, якую пакінуў у 1818. Выкладаў. Выдаў выкладчыцкія, а ў 1856—60 рэдагаваў «Кіевскую старину». Пісаў на рус. і ўкр. мовах. Аўтар аповесцей «Мелашка», «Ганна Ісаеўна», «Пасынак», «Пан Твардоўскі», «Пан Халявскі», «Пан Халяпскі», «Пан Халімон», «Пан Халібала», «Пан Халіпа», «Пан Халіфа», «Пан Халіла», «Пан Халіпа», «Пан Халіфа», «Пан Халіла», «Пан Халіпа», «Пан Халіфа», «Пан Халіла

Г. дз. абумоўлена іх зместам, характарам, правіламі і інш. Месца гульні ў жыцці дзіцяці, яе змест і арганізацыя залежаць ад узроставых асаблівасцей дзяцей. Амаль усе гульні — калектыўныя і патрабуюць ад удзельнікаў выканання пэўных правілаў паводзін, прывучаюць дзяцей і падлеткаў падпарадкоўваць свае дзеянні выкананню агульнай задачы, з'яўляюцца сродкам камуніст. выхавання дзяцей.

Г. дз. сваім зместам адлюстроўваюць віды дзейнасці чалавека: дзеці «ходзяць на работу», гуляюць у касманаўтаў, лётчыкаў, пагранічнікаў, уяўляюць сябе героямі-капітанамі, «будуюць» дамы, машыны і г. д. Адрозніваюць Г. дз. прадметныя (з цацкамі і інш. прадметамі), сюжэтныя (імітацыя працоўных, гераічных і інш. дзеянняў дарослых), рухомыя (спартыўна-маторныя), дыдактычныя (настольныя гульні, гульні-галаваломкі, шарады, загадкі, займальныя задачы, шахматы, канструяванне і інш.). У кожнага народа ёсць свае ўлюбёныя гульні, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Беларускія народныя дзіцячыя гульні — «пеўні», «птушкі ляцяць», «галубы», «жартаўнік», «хапанка», «рэдзька», «мароз», «Іванка», «пастух і воўк», «млын», «высокі дуб» і інш. Гл. таксама *Беларускія народныя гульні, Гульні народныя.*

Літ.: Макаренко А. С. Книга для родителей, М., 1969; Вількін Я. Р. Беларускія народныя гульні. Зб. дзіцячых гульняў, Мн., 1969; Говар І. І. У вольны час, Мн., 1963; Бородова А. Л. Дидактическая игра как средство развития детей, Мн., 1967; Былеева Л. В. и Яковлев В. Г. Подвижные игры, М., 1959; Былеева Л. В. Сборник подвижных игр, М., 1960.

ГУЛЬНІ НАРОДНЫЯ, абумоўленыя пэўнымі правіламі і прыёмамі забавы, сродак фізічнага, эстэтычнага, разумовага і маральнага выхавання. Паходжанне Г. н. цесна звязана з працоўнай і грамадскай дзейнасцю чалавека. На пачатку гульні былі састаўной часткай абрадаў.

Г. н. разнастайныя ў розных народаў, найб. уласцівыя дзецям і моладзі. На Беларусі Г. н. адлюстроўваюць традыц. заняткі людзей, найчасцей звязаны з с.-г. работамі («проса», «мак», «рэдзька»), з бытам сяляніна («вол», «гусі», «каза», «воўк», «каршун», «лён», «каноплі», «цапы»), з каляндарна-аграрнымі і сямейна-бытавымі абрадамі і ўрачыстасцямі («ваджэнне казы», «жаніцьба Цярэшкі», «страла»). На некаторых Г. н. адбіўся ўплыў гістар. падзей і сац. адносін («прыгон», «у эканома», «у стральца», «анёл і чорт», «у папа», «катаржнік»). За гады Сав. улады рэпертуар Г. н. папоўніўся новымі элементамі, звязанымі з сучаснай рэчаіснасцю. Гл. таксама *Беларускія народныя гульні, Гульні дзіцячыя.*

Літ.: Плеханов Г. В. Письма без адреса. Письмо третье, Соч., т. 14, М., 1925; Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии. Игры и игроки, «Этнографическое обозрение», 1897, № 3; Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 8, Вильна, 1912; Довнар-Запольский М. В. Крестьянские игры в Минской губернии, «Живая старина», 1891, в. 4; Игры народов СССР. Сб. материалов, М.—Л., 1933.

Г. А. Барташэвіч. Мінск.

ГУЛЬНЯЎ ТЭОРЫЯ, раздзел матэматыкі, які вывучае правілы паводзін, што забяспечваюць найлепшыя вынікі ў канфліктных сітуацыях (калі сутыкаюцца інтарэсы двух ці болей бакоў). Канфліктнай сітуацыі ўласціва, што ніводзін з бакоў не ведае загадзя, якія будуць дзеянні праціўніка. Таму Г. т. часта разглядаюць як тэорыю прыняцця рашэнняў ва ўмовах неакрэсленасці.

Каб зрабіць магчымым аналіз колькасных заканамернасцей канфліктнай сітуацыі, будуецца спрошчаная мадэль, якая наз. гульнёй. Гульня вызначаецца фармалізаванымі правіламі, якія апісваюць магчымыя дзеянні бакоў і вынік гульні, да якога вядзе дадзеная сукупнасць дзеянняў. Прыклады гульняў: шахматы, шашкі, гульні ў карты. Калі гуляюць два праціўнікі, гульня наз. парнай, калі больш — множнай. Вынік гульні вызначаецца выйгрышамі бакоў (некат. выйгрышы могуць задавацца адмоўнымі велічынямі). Гульня, у якой сума ўсіх выйгрышаў роўна нулю, наз. гульнёй з нулявой сумай. У парных гульнях з нулявой сумай інтарэсы бакоў прама процілеглыя. Гэты самы просты клас гульняў вывучаны найбольш поўна.

Адно з асн. паняццяў Г. т.— стратэгія (сукупнасць правілаў, якія адназначна вызначаюць выбар таго ці інш. рашэння ў залежнасці ад ходу гульні). Мэта Г. т.— выбар кожным іграком аптымальнай стратэгіі, якая забяспечвае яму максімальны выйгрыш. Выйгрыш, які атрымлівае адзін з іракоў пры выкарыстанні абодвума іракамі сваіх аптымальных стратэгій, наз. цаной гульні. Гульня наз. канечнай, калі кожны ігрок мае толькі канечны лік стратэгій, бесканечнай — у процілеглым выпадку. Канечная парная гульня, у якой адзін ігрок мае m стратэгій, а другі n стратэгій, наз. гульнёй $m \times n$, ці матрычнай. У гэтым выпадку гульню можна задаць прамавугольнай *матрыцай*, радкі якой адпавядаюць стратэгіям аднаго іграка, калонкі — стратэгіям другога, а элементы апісваюць выйгрышы першага іграка пры выкарыстанні праціўнікамі адпаведных стратэгій. Асн. вынікі Г. т. атрыманы на аснове прынцыпу мінімакса, які рэкамендуе выбіраць стратэгію, што дае макс. выйгрыш пры найменшых (мінімальна) зручных дзеяннях праціўніка. Матрычныя гульні з нулявой сумай рашаюцца метадамі лінейнага праграмавання (гл. *Лінейнае і нелінейнае праграмаванне*) і метадам ітэрацый (гл. *Ітэрацыя*). Для бесканечных гульняў, множных гульняў і гульняў з ненулявой сумай яшчэ не знойдзены агульныя метады рашэння. Вывучаюцца пазіцыйныя гульні (стратэгіі разглядаюцца як функцыі часу) і дыферэнцыяльныя (бесканечныя гульні, стратэгіі якіх апісваюцца дыферэнцыяльнымі ўраўненнямі).

Пачатак Г. т. далі прынцып мінімакса, абгрунтаваны ў 1928 амер. матэматыкам Дж. фон Нейманам, а таксама работы ням. матэматыка Э. Цэрмела і франц. матэматыка Э. Барэля, апублікаваныя крыху раней. Самастойнай галіной матэматыкі Г. т. стала ў 1944, калі выйшла манаграфія Неймана і О. Моргенштэрна «Тэорыя гульняў і эканамічныя паводзіны».

Літ.: Воробьев Н. Н. Математическая теория игр, Л., 1963; Вентцель Е. С. Элементы теории игр, 2 изд., М., 1961; Мак-Кинси Дж. Введение в теорию игр, пер. с англ., М., 1960; Льюс Р. Д. и Райфа Х. Игры и решения, пер. с англ., М., 1961. *В. С. Айзенштат, М. А. Леплійскі.* Мінск.

ГУЛЯЕЎ Анатоль Іванавіч (н. 19.11.1920, в. Людзечня Тульскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў чэрв. 1944 каля Сіроціна Віцебскай вобл. У баі ўзяў на сябе камандаванне ўзводам, які перарэзаў чыг. палатно, фарсіраваў Зах. Дзвіну. Цяжка паранены не пакінуў поля бою. Жыве ў Маскве.

ГУЛЯЕЎ Дзмітрый Цімафеевіч [23.10(5.11). 1915, г. Яранск Вяцкай губ.— 5.9.1943], удзельнік партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Чаркаскі дарожна-буд. тэхнікум (1934). У Чырв. Арміі з 1936. У партызанах з ліп. 1941, камандзір атрада з крас. 1942. З мая 1943 камандзір *партызанскай брыгады 101-й* імя Аляксандра Неўскага, якая дзейнічала ў Старобінскім і Любанскім р-нах Мінскай вобл. Загінуў у баі каля в. Панічы. Пахаваны ў парку г. п. Старобін. Яго імем названы калгас у Любанскім р-не, школа і вул. ў Старобіне, вуліца ў Салігорску.



Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 342—349.

І. Р. Ключановіч. Старобін.

ГУЛЯЎНІК (Sisymbrium), род адна-, двухі шматгадовых травяністых раслін сям. крыжакветных. Вядома каля 50 відаў, пашыраных на ўсім зямным шары. У СССР 24, на Беларусі 5 відаў.



Гуляўнік лекавы.

Сцябло простае, радка галінастае, голае ці з валаскамі, выш. да 1 м. Лісце надрэзанае або перыстараздзельнае, эрэдку цэласнае. Кветкі дробныя, жоўтыя або белыя, сабраныя ў гронкі. Плод — ланцэтны стручок. Найб. пашыраны на Беларусі Г. Лезеля (S. Loeselii, нар. назвы: крывавец, кудзер, палявая рута) і Г. лекавы (S. officinale, нар. назва кудзер лекавы). Расце Г. на палях як пустазелле, на дарогах, у садах. Лекавая расліна.

Літ.: Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968.

ГУМА (лац. gummi клей), рызіна (лац. resina смала), матэрыял, які атрымліваюць вулканізацыяй каўчуку. Мае высокую эластычнасць і трываласць, здольнасць да вял. абарачальных дэфармацый, устойлівасць да дзеяння актыўных хім. рэчываў, малую водаі газапранікальнасць, нізкую электраправоднасць і інш. Матэрыял для вырабу шын, прывадных пасаў, транспарцёрных стужак, трубак, шлангаў, эл.-тэхн. прылад, ізаляцыі, антыкаразійных пакрыццяў, абутку, адзення, рэчаў санітарыі і гігіены.

У залежнасці ад прызначэння Г. вырабляюць з розных тыпаў *каўчуку.* Напр., маслабензаўстойлівую — з сінт. бутадыен-нітрыльных або поліхлорпрэнавых; Г., устойлівую да высокай т-ры,— з сілаксанавых каўчукаў і фторэластычальных палімераў; Г. з высокім супраціўленнем дынамічным дэфармацыям і зносу (для аўтамаб. шын) — з стэрарэгулярных ізапрэнавых і бутадыенавых каўчукаў, з іх камбінацый і з бутадыен-стырольнага каўчуку. Каўчуку ў Г. ад 5 да 98%. Акрамя каўчуку, у гумавую сумесь уваходзяць: вулканізатары (сера, арган. перакісы; гл. *Вулканізацыя*), паскаральнікі вулканізацыі (тыурамы, тыязолы, гуанідзіны), актыватары паскаральнікаў (вокісы металаў), *напаўняльнікі* (сажа, мел), пластыфікатары (пераважна складаныя эфіры двухасноўных арган. кіслот), *процістарыцелі* (фенолы, амíны), фарбавальныя рэчывы. У простых выпадках Г. мае 5—6 інгрэдыентаў, у найскладанейшых — да 20. Адрозніваюць наст. асноўныя групы: 1) Г. агульнага прызначэння, выкарыстоўваецца пры т-рах ад —50 да 150 °С (шыны, пасы, пракладкі, амартызатары, абутак). 2) Цеплаўстойлівая Г., вытрымлівае т-ры вышэй за 150 °С (дэталі машын, самалётаў, электрарухавікоў). 3) Марозаўстойлівая Г., выкарыстоўваецца пры т-рах ніжэй за —50 °С (для паўн. раёнаў). 4) Маслабензаўстойлівая (шлангі, рэзервуары). 5) Г., устойлівая да дзеяння агрэсіўных асяроддзяў (кіслот, шчолачаў). 6) Порыстая Г., ужываецца для амартызацыі і як цеплаізаляцыйны матэрыял. 7) Г., устойлівая да радыяцыі (дэталі рэнтгенапаратаў, ахоўнае адзенне). 8) Дыэлектрычная Г. для ізаляцыі кабеляў. 9) Цвёрдая Г. (эбаніт) — дыэлектрык, хім. інертны і водаўстойлівы.

У БССР прадукцыю з Г. даюць *Бабруйскі завод гумавых тэхнічных вырабаў* (гумавы лінолеум, брызол, рукавы з ніткавай аплёткай, фармавыя і нефармавыя вырабы і інш.), Крычаўскі з-д гумавых вырабаў імя 50-годдзя БССР (абутак), Барысаўскі з-д гумаватэхнічных вырабаў (фармавыя і нефармавыя гумавыя вырабы, цацкі і інш. тавары нар. ўжытку), Магілёўскі рэгенератны з-д (рэгенерат). Будуецца *Беларускі шынны камбінат* у Бабруйску. Гумавая прамысл. БССР у 1970 вырасла ў 14,3 раза (у грашовым вылічэнні) у параўнанні з 1960.

Літ.: Кошелев Ф. Ф., Корнев А. Е. и Климов Н. С. Общая технология резины, 3 изд., М., 1968; Приклонская Н. В. и Скачков А. С. Скоростные методы приготовления резиновых смесей, М., 1963; Гофманн В. Вулканизация и вулканизующие агенты, пер. с нем., Л., 1968.

М. Я. Казанцаў. Мінск.

ГУМАВЫ АБУТАК, абутак, які вырабляецца з гумавых сумесей (на аснове натуральнага або сінтэтычнага каўчуку) і тэкстыльных матэрыялаў. Прызначаецца для засцярогі ног ад вільгаці, шкоднага дзеяння хім. рэчываў і нафтапрадуктаў, а таксама ад паражэння чалавека эл. токам. У БССР некат. віды Г. а. вырабляюцца на абутковых прадпрыемствах Гомеля, Крычава, Капыля.

Г. а. бывае агульнага прызначэння, гарнiцкашахцёрскі, рыбацкі, для рабочых хім. вытворчасці і інш. Падзяляецца на мужчынскі, жаночы, хлапчуковы, дзявочы, дзіцячы. Адрозніваюць боты, паўботы, боцікі, чуні, туфлі, галёшы. Мае падкладку з гладкай або варсістай тканіны (трыкатажу) для ўмацавання, цеплаізаляцыі і аздаблення. Гл. таксама *Абутак.*

ГУМАНІЗМ (лац. humanus чалавечны), сукупнасць уяўленняў пра чалавека, яго ўзаемаадносіны з інш. людзьмі, грамадствам і ў пэўнай ступені з прыродай, якія грунтуюцца на прынцыпе: чалавек — вышэйшая істота для чалавека. Уключае патрабаванні любві і павагі да чалавека і яго годнасці, абароны яго правоў і інтарэсаў, стварэння неабходных умоў для ўсебаковага развіцця асобы, а таксама сац. практычную дзейнасць грамадства, класаў, партый і асобных індывідаў, накіраваную на рэалізацыю гуманіст. ідэй. Сапраўдны выразнік высакародных ідэалаў Г.— рабочы клас. Тэарэт. навук. абгрунтаванне яго прынцыпаў дала марксісцка-ленінская філасофія. Класікі марксізма-ленінізма раскрылі антыгуманную прыроду бурж. ладу і прыватнай уласнасці, якая ва ўмовах капіталізму выклікае ўсеагульны працэс адчужэння з яго спараджэннямі (бурж. індывідуалізм, нацыяналізм, грабежніцкія войны). У. І. Ленін, развіваючы марксізм у новых гістар. умовах,

паказаў, што імперыялізм як вышэйшая і апошняя стадыя капіталізму з яго хранічным беспрацоўем, ростам дарагоўлі жыцця і прыгнёту, мілітарызмам, паліт. рэакцыяй даводзіць працэс дэгуманізацыі да апошняй мяжы. Імперыялізм стварае пагрозу элементарным умовам існавання чалавецтва. «Без сацыялізма няма выратавання чалавецтву ад войнаў, ад голаду, ад гібелі яшчэ мільёнаў і мільёнаў людзей» (Ленін У. І. Тв., т. 24, с. 18). Марксісцкі Г. уключае ў крытычна перапрацаваным выглядзе ўвесь станоўчы змест гуманіст. спадчыны мінулага. Найб. поўна адлюстроўвае вучэнне пра неабходнасць рэвалюц. знішчэння капіталіст. грамадскіх адносін і ўсталяванне дыктатуры пралетарыяту. Ліквідацыя класавых і нац. антаганізмаў, сац. раўнапраўе людзей абумоўліваюць сапраўды чалавечыя адносіны ў сацыяліст. калектыве. Гэта мае вял. значэнне ў гуманіст. выхаванні новага чалавека. Сацыяліст. калектывізм, які ахоплівае ўсе бакі новага грамадства і мае вышэйшае выяўленне ў пралет. інтэрнацыяналізме, адлюстроўвае сутнасць сацыяліст. Г. Палітыка КПСС, накіраваная на барацьбу супраць імперыялізму і недапушчэнне новай сусв. вайны, на буд-ва камунізма ў СССР,— канкрэтнае выяўленне марксісцка-ленінскага гуманізму.

Гуманіст. ўяўленні ўзнікаюць і развіваюцца ў непарыўнай сувязі з навук. і філас. ведамі ў перыяд расколу грамадства на антаган. класы. Барацьба працоўных мас за сац. вызваленне жывіла гуманіст. ідэі свабоды і шчасця чалавека. Ідэал чалавека антычнасці, які найб. поўна паказаны ў стараж.-грэч. культуры і якому належала значная роля ў гуманіст. руху эпохі *Адраджэння*, вызначаўся невырашальнай супярэчнасцю: выключаў з паняцця «чалавек» мільёны рабоў, зводзіў іх да ролі «прылад, што гавораць». Мысліцелі, мастакі і ідэолагі эпохі Адраджэння (Леанарда да Вінчы, Дж. Бруна, Г. Галілей, Ф. Бэкан, Эразм Ратэрдамскі і інш.) паказалі ідэал свабоднага, гарманічна развітага чалавека, гаспадара і стваральніка свайго жыцця і шчасця. Бурж. Г. узнік у барацьбе буржуазіі, якая тады нараджалася, з феад.-рэліг. ідэалогіяй, якая не давала чалавеку права на зямное шчасце і радасць, падначальвала яго фантаст. тагасветным сілам. Развіўся пад сцягам абароны свабоднага і гарманічна развітага чалавека. Аднак патрабаванне прыватнай уласнасці як неабходнай умовы свабоднага развіцця асобы сведчыла пра класавую абмежаванасць бурж. Г. Эксплуатацыя, збяднение працоўных мас вывелі глыбокі разрыў паміж бурж. гуманіст. ідэаламі і капіталіст. рэчаіснасцю. З сярэдзіны 19 ст. пачаўся крызіс і распад бурж. Г. Яго беспадстаўнасць выявілася ў вялікім антыгуманізме імперыяліст. буржуазіі, ідэолагі якой «абгрунтоўваюць» несумяшчальнасць прынцыпаў Г. з «машыннай цывілізацыяй» і гэтым маскіруюць антычалавечую сутнасць капіталіст. грамадскіх адносін. Ідэолагі імперыялізму для барацьбы супраць сацыялізма і камунізма карыстаюцца ідэямі абстрактнага Г., які ператварыўся ў бурж. лібералізм і прыхарошвае сучасны капіталізм псеўдагуманнымі фразамі. Пераадолець абмежаванасць бурж. Г. спрабавалі прадстаўнікі утапічнага сацыялізма Р. Оўэн, Р. Сен-Сімон, Ш. Фур'е. Яны абаранялі інтарэсы прац. мас і звязвалі магчымасць ажыццяўлення ідэалаў Г. з ліквідацыяй прыватнай уласнасці і эксплуатацыі, устараненнем грамадскай уласнасці і сац. роўнасці, але яны не змаглі знайсці і паказаць грамадскіх сіл, шляхоў і сродкаў, неабходных для гэтага. Рускія рэвалюц. дэмакраты (В. Бялінскі, М. Чарнышэўскі, М. Дабралюбаў) спалучалі Г. з ідэяй рэвалюц. пераўтварэння грамадства.

На Беларусі Г. як ідэйны кірунак складваецца ў 15—16 ст. Гэта звязана з глыбокімі зменамі ў феад. грамадстве і перш-наперш з развіццём гарадоў і гарадской культуры. Вял. значэнне ў фарміраванні Г. на Беларусі мела яго сувязь з агульнаеўрап. Адраджэннем і прагрэс. думкай Расіі. У процівагу пануючым аскетычным поглядам хрысц. багасловаў у філас. і сацыялагічнай думцы абуджаецца цікавасць да чалавека, яго ўнутранага свету, мацнее перакананасць у яго высокай годнасці, сіле інтэлекту, праве на неабмежаванае развіццё здольнасцей (М. Гусоўскі, Ф. Скарына, М. Літвін, С. Будны, Л. Зізаній, М. Сматрыцкі, М. Чаховіц, А. Волян, Ф. Соцын і інш.). Бел. мысліцелі шукаюць апоры для барацьбы з сярэдневяковымі рэліг.-філас. канцэпцыямі ў ант. культуры. Вывучаюцца і перакладаюцца творы еўрап. гуманістаў Эразма Ратэрдамскага, Л. Вала, С. Кастэліо, М. Сервета, А. Фрыча Маджэўскага, М. Рэя, Я. Каханоўскага і інш. Крытыкуецца феад.-прыгонніцкая сістэма, грамадскі і дзярж. лад краіны, судаводства і феад. права, саслоўныя і класавыя адносіны, унутраная і знешняя палітыка. Умераным сацыялагічным поглядам гараджан і прагрэс. шляхты процістаяць антыфеад., утапічныя наіўна-камуніст. погляды гуманістаў, якія адлюстроўвалі імкненні гарадскіх нізоў і сялянства. Выразнікі ўмеранагуманіст. канцэпцыі Будны, В. Цяпінскі і іх аднадумцы настойвалі на рэфармаванні сац. жыцця краіны, прыстасаванні дзярж. і грамадскіх адносін да новых гістар. умоў. Ідэолагі нар. Г. (М. Чаховіц, Якуб з Калінаўкі, Пётр з Ганёндза) патрабавалі карэннага пераўтварэння рэчаіснасці ў інтарэсах чалавека, ліквідацыі не толькі прыгону, але ўсякай няроўнасці, усталявання братэрства між людзьмі. Фарміруецца перакананне ў неабходнасці свабоды слова і думкі як неад'емных правоў чалавека і неабходных умоў для нармальнага функцыянавання грамадскага жыцця (Будны, Чаховіц, Зізаній). Бел. атэіст і матэрыяліст К. Лышчынскі адкінуў веру ў бога і сцвярджаў, што чалавек усемагутны, мае неабмежаваныя здольнасці. Ян Белабоцкі паставіў філасофію вышэй за багаслоўе і гэтым абвясціў, што стварэнні чалавечага розуму вышэй за багаслоўскія ісціны. Ідэі Г. развіваліся ў творчасці філосафаў-асветнікаў Беларусі 18 — пач. 19 ст. М. Пачобута-Адляніцкага, Я. Снядэцкага, А. Снядэцкага, М. Ачапоўскага, В. Карчэўскага, М. Глушневіча, П. Славінскага, А. Доўгірда, І. Страйноўскага і інш. Яны цікавяцца галінамі ведаў, якія вывучаюць чалавека (псіхалогіяй, педагогікай, сацыялогіяй, маральнай філасофіяй, або этыкай). Доўгірд лічыў чалавечае шчасце адным з гал. крытэрыяў маральных нормаў усякага грамадства. Чалавек дасягае найб. шчасця тады, калі вызваляецца ад пакут. Толькі тое грамадства разумнае і дасканалае, якое стварае ўмовы для шчасця ўсіх яго членаў. Большасць бел. асветнікаў асн. фактарам прагрэсу грамадства і чалавека лічыла асвету, а не рэвалюц. пераўтварэнне сац. адносін. Некат. асветнікі абаранялі тэорыю натуральнага права, бурж. прынцып роўнасці людзей, патрабавалі, каб сялянам была дадзена асабістая свабода (Страйноўскі), а прыгон адменены (М. Карповіч). Мысліцелі-дэмакраты 19 ст. зрабілі вывад, што для дасягнення сац. справядлівасці неабходна рэвалюц. пераўтварэнне грамадства. Члены таемнага т-ва *філаматаў* (Ян Чачот, Ю. Жакоўскі, Т. Зан, А. Міцкевіч) патрабуюць скінуць царскае самадзяржаўе, ліквідаваць прыгон. Ідэал Ф. Савіча — грамадства роўнасці і братэрства, якое можа быць усталявана ў выніку рэвалюц. барацьбы. Вырашальная сіла рэвалюцыі — народ. Барацьбу за сваю свабоду беларусы павінны весці разам з рус., літ. і польскім народамі. М. Лавіцкі гаварыў, што трэба змяніць сац. парадкі, каб грамадства давала людзям усіх саслоўяў і класаў роўныя магчымасці для развіцця здольнасцей. Неабходнасць актыўнай, рэвалюц. дзейнасці чалавека абгрунтоўваў К. Каліноўскі. Ен лічыў, што для барацьбы з самаўладдзем і прыгонам неабходны саюз народаў Расіі, аб'яднанне намаганняў бел. народа з братнім рускім народам. Рэвалюц.-дэмакр. Г. развіваўся далей у творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, М. Багдановіча, З. Бядулі, Ц. Гартнага, якія выступалі за права беларусаў «людзьмі звацца», за рэвалюц. пераўтварэнне грамадства.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, раздз. 12, 13, 24; яго ж. Тэзісы аб Фейербаху, у кн.: Энгельс Ф. Людвіг Фейербах і канец класічнай нямецкай філасофіі. Мн., 1953; яго ж. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954, с. 5—20; Ленін У. І. Сістэма Тэйлора — заняволенне чалавека машынай, Тв., т. 20 (Полн. собр. соч., т. 24); яго ж. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); Проблемы гуманизма в трудах В. И. Ленина, Мн., 1970; Петросян М. И. Гуманизм, М., 1964; Волгин В. П. Гуманизм и социализм, М., 1955; Подокшин С. А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы, Мн., 1970; Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии, Мн., 1962; 450 год беларускага кнігадрукавання, Мн., 1968; Федосеев П. Н. Гуманизм в современном мире, у кн.: Человек и эпоха, М., 1964; История философии в СССР в 5-ти томах, т. 1—3, М., 1968. *І. А. Рабкоў, С. А. Падокшын.* Мінск.

ГУМАНІТАРНАЯ АДУКАЦЫЯ, адукацыя ў галіне грамадскіх навук (філасофіі, гісторыі, філалогіі, мастацтва і інш.). Да яе адносяцца *гістарычная адукацыя, журналісцкая адукацыя, мастацтвазнаўчая адукацыя, музычная адукацыя, педагагічная адукацыя, філалагічная адукацыя, філасофская адукацыя, эканамічная адукацыя, юрыдычная адукацыя* і інш.

ГУМАР (англ. humour, ад лац. humor літар. вільгаць), форма *камічнага*, у якой прадметы, падзеі, людзі і іх учынкі паказваюцца ў смешным выглядзе. Мастацтва, якое адлюстроўвае аб'ектыўную рэчаіснасць, увасабляе ў вобразах гэтыя камічныя рысы і з'явы. Г. уласцівы сапраўднаму мастацтву, мае зычлівы характар і не супярэчыць прынцыпам праўды, бо накіраваны на з'явы жыцця, гумарыстычныя па характары і змесце. Мастацтву сацыяліст. рэалізму ўласцівая стваральна-гуманістычная, жыццесцвярджальная роля Г., які з'яўляецца і зброяй барацьбы з адмоўнымі рысамі і недахопамі. Г. сцвярджае галоўнае, істотнае і памагае збавіцца ад усяго наноснага, паўней раскрыцца новаму, грамадска-каштоўнаму. Акрамя агульных рысаў, Г. мае і нац. асаблівасці, якія адлюстроўваюць гістар. вопыт нацыі, яе традыцыі, звычаі і выяўляюцца праз нац. мову, праз уласцівыя толькі ёй чароўнасць, самабытнасць, жыццёвасць. Г.— асн. элемент многіх твораў бел. л-ры і фальклору.

Літ.: Борев Ю. Б. Основные эстетические категории, М., 1960. *Ю. А. Гусеў.* Мінск.

ГУМАРЭСКА (ням. Humoreske, ад Humor гумар), 1) у літаратуры — невялікі вершаваны або празаічны твор пра смешную прыгоду ці рысу характару чалавека. Смех у Г. не такі, як у фельетоне, а дабрадушны, незласлівы. Г. пісалі Г. Гейнэ, П. Беранжэ, А. Чэхаў, У. Маякоўскі, І. Франко, А. Вішня, у бел. л-ры — Ядвігін Ш., Я. Колас, К. Крапіва, А. Вольны, А. Дзяркач і інш. 2) У музыцы — тып інструментальнай мініяцюры, вытрыманай у капрызным, жартаўлівым, гумарыстычным характары. Створана ў час рамантызму (Р. Шуман). Г. пісалі А. Дворжак, П. Чайкоўскі, С. Рахманінаў, з бел. кампазітараў — М. Аладаў, У. Алоўнікаў, Дз. Камінскі, П. Падкавыраў, А. Туранкоў.

ГУМБАЛЬТ (Humboldt) Аляксандр Фрыдрых Вільгельм (14.9.1769—6.5.1859), нямецкі натураліст і падарожнік, вучоны-энцыклапедыст. Чл. Берлінскай АН (з 1800). Адзін са стваральнікаў краіназнаўства, ландшафтазнаўства, заснавальнік геаграфіі раслін. У 1799—1804 з франц. батанікам Э. Бапланам даследаваў Цэнтр. і Паўд. Амерыку, у 1829 ажыццявіў паездку на Урал, Алтай і Каспійскае м. У працы «Космас» зрабіў спробу падаць усе веды пра Сусвет і Зямлю. Імем Г. названы горы ў Цэнтр. Азіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі, возера і рака ў ЗША, ледавік у Грэнландыі, акіянічнае цячэнне каля берагоў Перу, шэраг раслін, мінерал (гумбальтыт), кратэр на Месяцы.

Тв.: Рус. пер.— Космос, ч. 1—5, М., 1848—63; География растений, М.— Л., 1936.

Літ.: Есаков В. А. Александр Гумбольдт в России, М., 1960.

ГУМЕННІК (Anser fabalis), птушка сям. качыных падсям. гусіных атр. гусепадобных. Пашыраны ў тундрах Еўропы і Азіі. На Беларусі бывае ў час пералётаў.

Даўж. 730—900 *мм*, маса да 4,5 *кг*. Апярэнне цёмна-бурае з шэрым налётам на краях пёраў. Надхвосце, падхвосце і бруха белыя. Крылы бураватa-чорныя. Жыве ў тундры, лесатундры і на глухіх лясных вадаёмах. Гняздуецца на зямлі. Нясе 3—6 яец. Корміцца раслінай ежай (ягадамі, ліслем, насеннем) і насякомымі. Прамысловы від.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ГУМІ (лац. gummi клей, грэч. kommi камедзь), камедзі, арганічныя рэчывы, комплексныя поліцукрыды, якія выдзяляюцца з параненых ствалоў некат. дрэў. Празрыстая маса, на паветры густее.

Растваральнікі ў вадзе, не растваральнікі ў спірце. У састаў Г. уваходзяць пентозы, метылпентозы, гексозы і уронавыя к-ты. Найб. вядомыя Г. розных відаў акацый (гумі-арабік), вішнёвага дрэва (вішнёвы клей) і інш. Выкарыстоўваюцца ў тэхніцы (канторскі клей), у медыцыне (абвалакальныя і памякчальныя сродкі).

ГУМІГУТ (лац. gummi guttae кроплі камедзі), малочны сок некат. трапічных раслін сям. святаяннікавых. Складаецца са смалы і гумі. Выкарыстоўваецца ў вытв. спіртавых лакаў і як жоўтая акварэльная фарба.

ГУМІДНЫ КЛІМАТ (ад лац. humidus вільготны), клімат з празмерным увільгатненнем. Гл. *Клімат*.

ГУМІЛЁЎСКІ Леў Мікалаевіч (н. 31.10.1930, Масква), беларускі савецкі скульптар. Вучыўся ў Бел. дзярж. тэатр.-маст. ін-це (1955—61) у А. Бембеля, А. Глебава. Сярод работ: «Партрэт скульптара У. Папсуева», 1958; «Салі-



Л. М. Гумілёўскі. Партызанская сям'я. Гіпс. 1968.

горск», 1961; «Так і канчаюцца школьныя гады», 1962; «Маці і сын», 1964; «С. Рахманінаў», 1965; «Навасёлы», 1966; трыпціх «Партызаны», 1967; «Партызанская сям'я», 1968; партрэты Я. Купалы, М. Фрунзе, А. Мяснікова, 1962—64 (з А. Анікейчыкам). У Дзярж. маст. музеі БССР 5 работ скульптара.

ГУМІНАВЫЯ КІСЛОТЫ (ад лац. humus глеба), комплекс высокамалекулярных азотзмяшчальных арганічных кіслот, прадукт разлажэння раслінных рэшткаў і найважнейшая састаўная частка перагною, торфу і бурых вугаляў. Малекулярная маса — 20—30 тыс. Будова малекулы высветлена недастаткова. Сярэдні элементны састаў Г. к. (%): 52—62 С, 3—5 Н, 32—39 О, 3—5 N. Г. к. маюць вял. значэнне для ўтварэння структуры глебы. У свабодным стане даюць калоідныя растворы, якія ўдзельнічаюць у жыўленні раслін.

Літ.: Почвоведение, М., 1969; Химизация сельского хозяйства, 2 изд., М., 1968.

ГУМНО, старадаўняя гаспадарчая пабудова для сушкі і хавання снапоў, абмалоту, ачысткі і сарціроўкі збожжавых. На Палессі наз. клуняю, на Пн Беларусі — токам. Пабудова звычайна зрубная на вуглах, з шуламі ў падоўжных сценах. Пасярэдзіне Г.— гліняны ток для малацьбы цапамі, абапал току — застаронкі, дзе складалі снапы, сена, мякіну. Часам у Г. або побач ставілі *асець* ці *ёўню* для падсушкі снапоў перад абмалотам.

ГУМУС, складанае аргана-мінеральнае злучэнне глебы. Гл. *Арганічныя рэчывы глебы*.

ГУМУСАВЫ ВУГАЛЬ, гл. *Вугалі выкапнёвыя*.

ГУНДУЛІЧ (Gundulić) Іван [8.1.1589(?), Дубраўнік — 8.12.1636], харвацкі паэт, прадстаўнік рэнесансавай л-ры рэспублікі Дубраўнік. З арыстакр. роду. Літ. дзейнасць пачаў у 1610 як перакладчык італьян. паэзіі. Пісаў драмы на сюжэты з ант. міфалогіі, дыдакт. творы ў духу каталіцкай Контррэфармацыі. Аўтар патрыят. драмы-пастаралі «Дубраўка» (паст. 1628). Вяршыня творчасці — эпічная паэма «Асман» (выд. 1826) у 20 песнях (14-я і 15-я не зберагліся) пра перамогу польскага войска над туркамі ў Хацінскай бітве 1621. Адлюстраванне гістар. падзей мяжуе ў ёй з паўд.-слав. легендамі і паданнямі, вобразамі міфалогіі і нар. побыту. Асн. ідэя — адзінства славян перад пагрозай нашэсця іншаземных захопнікаў.

Тв.: Рус. пер.— Осман, Мн., 1969.

Літ.: Зайцев В. К. Между Львом и Драконом (дубровницкое Возрождение и эпическая поэма И. Гундулича «Осман»), Мн., 1969.

ГУНО (Gounod) Шарль Франсуа (17.6.1818, Парыж — 18.10.1893), французскі кампазітар. Чл. Ін-та Францыі (1866). Вучыўся ў Парыжскай кансерваторыі (1836—39), атрымаў Рымскую прэмію за кантату «Фернан» (1839). У 1852—60 дырыжор хар. аб'яднання «Арфеон», у 1870—75 — хар. т-ва ў Лондане. Напісаў 12 опер (першая — «Сафо», 1850), сярод іх асобнае месца займае «Фаўст» паводле І. В. Гётэ (паст. 1859, новая рэд. 1869) — першы ўзор франц. лірычнай оперы. Натуральнасць у выяўленні пачуццяў, драматургічнае майстэрства, меладычнае багацце, дэмакратызм муз. мовы зрабілі «Фаўста» адной з найб. папулярных опер (паст. ў Бел. т-ры оперы і балета ў 1950). Сярод найлепшых опер Г. таксама «Мірэйль» (паст. 1864) і «Рамэо і Джульета» (паст. 1867). Адзін з пачынальнікаў франц. раманса, аўтар 2 сімфоній, духоўных твораў.

Літ. тв.: Воспоминания артиста. М., 1962.

Літ.: Федосова Э. «Фауст» Ш. Гуно, М., 1966.

ГУНЫ (грэч. Hunnoi, лац. Chunni, Hunni), аб'яднанні качавых плямёнаў, якія склаліся ад змяшання цюркамоўных плямёнаў хуну з угорскімі плямёнамі Прыўралля і Паволжа.

Старажытныя плямёны, вядомыя пад назвай хуну (у кіт. летапісах 3-га тысячагоддзя да н. э. ўпамінаюцца як хяньюнь і хуньюй), стварылі ў 3—2 ст. да н. э. ваен. саюз на тэрыторыі Манголіі і Паўд. Прыбайкалля, валодалі з Кітаем. У сярэдзіне 1 ст. да н. э. падзяліліся, частка рушыла на З і змяшалася з мясцовымі плямёнамі (з гэтага часу маюць назву Г.). У 375 г. разгромілі *готаў*, пачалі нападаць на Рымскую імперыю (гл. *Вялікае перасяленне народаў*). Найб. магутнасці дасягнулі пры *Атыле*. Пасля яго смерці Г. адступілі ў Прычарнаморʼе, адтуль нападалі на Візантыю (469), але былі нагенезе чув. народа.

Кр.: Аммиан Марцеллин. История, в. 1—3, Киев, 1906—08; Иордан. О происхождении и деяниях гетов, пер. с лат., М., 1960.

Літ.: Иностранцев К. А. Хунну и гунны, 2 изд., Л., 1926.

ГУПЯНЁЦ Піліп Аляксеевіч [н. 5(18).10.1910, в. Воўчын Брэсцкага пав. Гродзенскай губ.], кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПЗБ з 1932. Чл. КПСС з 1953. 10 гадоў быў пастухом у абшарнікаў. У 1931—33 у польскай арміі. У 1935 за паліт. дзейнасць арыштаваны ўладамі Польшчы і засу-

джаны на 5 гадоў. З 1939 трактарыст Высокаўскай МТС Брэсцкай вобл. У Чырв. Арміі з жн. 1944. Удзельнічаў у баях на тэр. Польшчы, Германіі. Камандзір кулямётнага разліку, малодшы сяржант Г. вызначыўся 26.1.1945 у баях за мяст. Задкі (Польшча), знішчыў 2 агнявыя кропкі ворага; 20.3.1945 на падыходзе да Одэра адбіў варожую контратаку; 20.4.1945 у баі за г. Бернаў (Германія) знішчыў 2 агнявыя кропкі. Жыве на радзіме.

ГУРАМІШВІЛІ Давід [1705, с. Сагурама каля Мцхеты — 21.7(1.8).1792], грузінскі паэт. З княскага роду. У 1727 узяты ў палон лезгінамі. З Дагестана ўцёк у Расію. З 1729 жыў у Маскве, прыняў рус. падданства. У 1738 паступіў на вайск. службу ў гусарскі полк, удзельнічаў у вайне з туркамі, шведамі, у Сямігадовай вайне. З 1760 жыў у Міргарадзе (Украіна). Збярогся зб. аўтабіягр. твораў Г. «Давітыяні» (датаваны вер. 1787), куды ўвайшлі дзве паэмы і лірычныя вершы. У паэме «Беды Грузіі» праўдзіва паказаны трагічны перыяд гісторыі Грузіі 1-й пал. 18 ст.: набегі ворагаў, унутр. міжусобіцы; выкрываецца свецкая і духоўная феад. знаць. Спагадай да сялян прасякнута рэаліст. паэма «Пастух Кацвія». У лірычных вершах выкарыстоўваў укр. і рус. нар. песні. Творчасць Г. мела вялікі ўплыў на груз. л-ру 19 ст.

Тв.: Рус. пер.— Стихотворения и поэмы, 3 изд., Л., 1956.

Літ.: Леонидзе Г. Жизнь и творчество Давида Гурамишвили, Тбилиси, 1956.

ГУРАЎ Іван Пятровіч (1924, в. Сіліна Яфрэмаўскага пав. Тульскай губ.— 28.11.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з ліст. 1941. Вызначыўся 23—25.7.1944 каля в. Ямна Брэсцкага р-на. Гарматны разлік, наводчыкам у якім быў яфрэйтар Г., захапіў вышыню. У час контратакі ворага амаль увесь разлік загінуў. Цяжка паранены Г. адбіў контратаку. Загінуў у баі пад г. Ліепая. Яго імем названа вуліца ў Брэсце.

ГУРВІЧ Ісак Адольфавіч (1860, Мінск — 1924), даследчык эканам. становішча сялян у Расіі. Аўтар кніг «Перасяленні сялян у Сібір» (рус. пер., 1888), «Эканамічнае становішча рускай вёскі» (рус. пер., 1896), у якіх раскрываў сувязь перасялення з расслаенне сялянства, развіццём капіталіст. адносін у вёсцы. У 1881—85 у ссылцы (Сібір). Пасля ссылкі ў Мінску, меў сувязь з групай «Вызваленне працы». З 1889 у эміграцыі. Перапісваўся з Ф. Энгельсам, У. І. Леніным. Па асн. пытаннях рус. рэвалюц. руху заняў пазіцыі рэвізіянізму.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 2, (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 2)]; К. Маркс, Ф. Энгельс и революционная Россия, М., 1967; Лушчыцкі І. і Іоська М. Фрыдрых Энгельс і рэвалюцыйная Беларусь, «Полымя», 1970, № 11.

ГУРДУС Іосіф Ісакавіч (н. 9.8.1926, Нова-Свянцяны Свянцянскага пав. Віленскага ваяводства), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1970). Чл. КПСС з 1956. Скончыў Маскоўскі ін-т сталі (1948). З 1948 на Мінскім аўтамаб. з-дзе: майстар, нач. лабараторыі, ст. тэхнолаг, гал. металург, з 1961 нам. гал. інжынера. Дзярж. прэмія СССР за стварэнне канструкцыі уніфікаванай сям'і высокапрадукцыйных вялікагрузных транспартных аўтамабіляў, аўтапаяздоў і аўтасамазвалаў МАЗ-500, за наладжванне іх выпуску на Мінскім аўтамаб. з-дзе.

ГУР'ЕЎ, горад, цэнтр Гур'еўскай вобл. Казахскай ССР, на р. Урал, пры ўпадзенні яе ў Каспійскае м. Рачны і марскі порт, чыг. станцыя. 113 тыс. ж. (1970). Засн. ў 1645 купцом М. Гур'евым. Цэнтр нафтавай і рыбнай прамысл. Нафтаперапр., хім., маш.-буд. з-ды, мясакамбінат, малочны камбінат, хлебны з-д. Нафтаправоды: Узень — Г.— Куйбышаў (1500 *км*) і Г.— Орск (720 *км*). НДІ: Заходнеказахстанскі геолагаразведачны, хіміі, нафты і прыродных соляў. Пед. ін-т, с.-г. і політэхн. тэхнікумы, муз. вуч. Драм. тэатр. Музей.

ГУР'ЕЎ Віктар Фёдаравіч (н. 11.8.1926, в. Барысаўка Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.), беларускі савецкі спявак (лірыка-драм. тэнар). Засл. арт. БССР (1967). Чл. КПСС з 1967. Пасля заканчэння Бел. кансерваторыі (1960) саліст Бел. т-ра оперы і балета. З партый: Мікола («Яснае світанне» А. Туранкова), Сяргей («Алеся» Я. Цікоцкага), Масальскі («Кастручнік» В. Мурадэлі), Галіцын («Хаваншчына» М. Мусаргскага), Князь («Русалка» А. Даргамыжскага), Арэст («Арэстэя» С. Танеева), Хазэ («Кармэн» Ж. Бізэ), Манрыка («Трубадур» Дж. Вердзі), Каварадосі («Тоска» Дж. Пучыні).

ГУР'ЕЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Казахскай ССР. Утворана 15.1.1938. Пл. 278,6 тыс. км². Нас. 499 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 9 раёнаў; 4 гарады, 27 гар. пасёлкаў. Цэнтр г. Гур'еў.

Размешчана ўздоўж паўн. і паўн.-ўсх. берагоў Каспійскага м. Берагавая лінія слаба парэзана; заліў Камсамолец, Мангышлакскі, Казахскі, п-вы Бузачы, Цюб-Караган. Большасць тэр. занята Прыкаспійскай нізінай. На ПдУ зах. ўскраіна плато Усцюрт выш. да 340 м, на п-ве Мангышлак хр. Мангыстау выш. да 556 м (г. Бесшакы). Есць глыбокія бяссцёкавыя западзіны; самая глыбокая Карарie (132 м ніжэй узр. м.). Карысныя выкапні: нафта, газ, каменны вугаль, жалезная, марганцавая і медная руды, каменная, калійная і інш. солі, гіпс, мергель, буд. матэрыялы. Клімат кантынентальны, засушлівы. Сярэдняя т-ра студз. ад −6 да −10 °С, ліп. 24—26 °С. Ападкаў 100—200 *мм* за год. Вегет. перыяд 200—230 дзён. Гал. рака Урал. Эмба, Уіл і Сагіз перасыхаюць або губляюцца ў пясках. Шмат азёраў, пераважна салёных, многія летам перасыхаюць, ператвараюцца ў саланчакі і соры. Глебы бурыя пустынна-стэпавыя, саланцы і саланчакі. Значныя плошчы займаюць пяскі (Рын-пяскі, Сам і інш.). Раслінасць палынна-салянкавая і злакава-палынная. На далінах рэк алювіяльна-лугавыя глебы са злакава-разнатраўнай раслінасцю, з зараснікамі таполі і вярбы. Пад лесам і хмызнякамі 4,9% тэр. Асн. насельніцтва казахі. Жывуць рускія, татары, украінцы. Сярэдняя шчыльн. 1,8 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 66%. Гарады: Гур'еў, Форт-Шаўчэнка, Шаўчэнка, Новы Узень.

Аб'ём валавой прадукцыі прамысл. павялічыўся ў 1969 у параўнанні з 1940 больш чым у 11,7 раза. Гал. галіны прамысл. нафтаздабыўная і рыбная. У Эмбінскім бас. больш за 20 нафтапромыслаў (Макат, Кульсары, Касчагыл, Дасор, Сагіз і інш.), на плато Мангышлак — Жэтыбай і Узень. У 1969 здабыта 9,9 млн. *т* нафты. У Гур'еве нафтаперапра-



цоўчы і хім. з-ды. Нафтаправод Гур'еў — Орск (720 *км*), Узень — Гур'еў — Куйбышаў (1500 *км*), Узень — Шаўчэнка (150 *км*). Г. в. дае больш паловы ўлову рыбы ў Казахстане (61 014 *т* у 1969). Рыбакансервавыя камбінаты і рыбазаводы ў Балыкшах, Форце-Шаўчэнка. Прадпрыемствы машынабудаўнічай, металаапр., суднарамонтнай прамысл. Харч. і лёгкая прамысл. Вытворчасць буд. матэрыялаў. Здабыча солі.

У с. гасп. пераважае жывёлагадоўля мясасальнага, мяснога і каракуляводчага кірунку. На 1.1.1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 111,5 (у т. л. кароў 45,6), авечак 1584,9, коней 66,3, вярблюдаў 60. Земляробства арашальнае і паліўное (пераважна ў далінах рэк). Пасяўная пл. 61,6 тыс. *га* (1970). Сеюць збожжавыя (проса, кукурузу, ячмень), кармавыя культуры, бульбу, агародніна-бахчавыя. Даўж. чыгунак 1735 *км* (1970). Суднаходства па Урале і Каспійскім м. Порты: Гур'еў, Форт-Шаўчэнка. Пед. ін-т, 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў. НДІ: нафтаздабыўной прамысл. (Шаўчэнка), Заходне-Казахстанскі геолагаразведачны; хіміі, нафты і прыродных соляў (Гур'еў). Тэатр, філармонія, 2 музеі (краязнаўчы ў Гур'еве і мемарыяльны Т. Шаўчэнкі ў Форце-Шаўчэнка). Абл. газеты «Коммунистік ембек» («Камуністычная праца») і «Прикаспийская коммуна».

А. Р. Назарэўскі. Масква.

ГУРЗУФ, кліматычны прыморскі курорт на беразе Чорнага м., гар. пасёлак у Крымскай вобл. УССР. За 16 *км* ад Ялты. Ад халоднага паветра з Пн і ПнУ заслонены хрыбтом Яйлы і г. Мядзведзь. На тэрыторыі курорта парк. Па клімаце Г. блізкі да Ялты. Сярэднегадавая т-ра каля 13 °С. Гарачае сухое лета, цёплая восень, кароткая з вятрамі зіма. Марскія купанні з чэрв. да кастр. Працуюць дамы адпачынку, санаторыі. Лечаць ад хвароб органаў дыхання (нетуберкулёзнага паходжання) і нервовай сістэмы, ад сардэчна-сасудзістых хвароб, парушэнняў абмену рэчываў, малакроўя. Сезон увесь год.

Літ.: Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967.

ГУРКА (Рамейка-Гурка) Іосіф Уладзіміравіч [16(28).7.1828—15(28).1.1901], рускі ген.-фельдмаршал (1894). З бел. дваранскага роду. Скончыў Пажаскі корпус (1846). Вызначыўся ў рус.-тур. вайне 1877—78. На чале рус. і балгарскіх войск вызваліў г. Тырнава, захапіў тур. ўмацаванні Горны Дубняк і Тэліш, акружыў Плеўну. У снеж. 1877 з 70-тысячным атрадам пераправіўся цераз Балканы і разбіў тур. войскі каля Ташкісена, Філіпопаля, авалодаў Адрыянопалем. З крас. 1879 нам. галоўнакамандуючага войск гвардыі і Пецярбургскай ваен. акругі, часовы ген.-губернатар Пецярбурга, з ліп. 1883 да снеж. 1894 ген.-губернатар Прывісленскага краю і Варшавы і камандуючы войск Варшаўскай ваен. акругі. Чл. Дзярж. савета. На зах. рус. граніцы стварыў умацаваныя раёны і стратэгічныя дарогі. З 1894 у адстаўцы.

Літ.: Беллев Н. И. Русско-турецкая война 1877—1878 гг., М., 1956; Шаховской Л. В. Два похода за Балканы, 3 изд., М., 1899; Мельцер Д. Б. Из истории белорусско-болгарских связей (участие белорусского народа в освобождении Болгарии от оттоманского гнета), у зб.: Вопросы истории БССР, в. 37, Мн., 1969.

ГУРКІ, паселішча 5—8 ст. і курганны могільнік 8—9 ст. з трупаспаленнем, каля хутара Гуркі Вілейскага р-на Мінскай вобл. Даследаваў А. Р. Мітрафанаў у 1956, 1964. Пры раскопках знойдзены жал. сярпы, нажы, гліняныя прасліцы, абломкі гладкасценнага посуду, жал. шлакі. На могільніку раскапана 7 курганоў; выяўлены гліняныя ляпныя пасудзіны з перапаленымі касцямі чалавека, бронзавыя спіралькі, пласцінкі, шкляныя пацеркі і жал. спражкі.

ГУРКІ, вёска ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобл., на левым беразе р. Дубоўкі. Цэнтр сельсавета. За 36 *км* на Пн ад Гарадка, 71 *км* ад Віцебска, 1,5 *км* ад чыг. ст. Грыбачы; аўтобусная ст. на шашы Ленінград — Адэса. 375 ж., гасп. 135 (1971). Васьмігадовая школа. Абеліск на брацкай магіле 140 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 54 мірных жыхароў вёскі.

ГУРКІ, вёска ў Ручэйскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Маяк». За 8 *км* на ПнУ ад Шаркоўшчыны, 194 *км* ад Віцебска, каля шашы г. п. Шаркоўшчына — в. Германавічы (2 *км*). 145 ж., гасп. 45 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка.

ГУРКО Аляксей Дзямідавіч [н. 29.11(12.12). 1904, в. Зачарнаўка Віцебскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1930. У Чырв. Арміі з 1926. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). З крас. 1942 камісар партыз. атрада; з мая 1942 камандзір атрада, з вер. 1943 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Віцебскай*. З жн. 1944 старшыня райвыканкома Кастрычніцкага р-на г. Віцебска, потым на сав. і гасп. рабоце ў Мінскай, Віцебскай абл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Віцебску.

ГУРЛО Алесь [Аляксандр Кандратавіч; 19(31).1.1892, Капыль — 4.2.1938], беларускі савецкі паэт. З сялян. Працаваў на з-дзе «Вулкан» у Пецярбурзе, у 1-ю сусв. вайну служыў на мінаносцы «Забіяка». Прымаў удзел у штурме Зімняга палаца. У складзе Волжскай флатыліі ваяваў супраць ворагаў Сав. улады, быў цяжка паранены. Працаваў у Інбелкульце, быў членам літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Полымя», «Пробліск». Літ. дзейнасць пачаў (1909) у газ. «Наша ніва». Творчасць Г. фарміравалася пад уплывам паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа. У дарэвалюц. вершах пра сялянскую нядолю гучаць свабодалюбныя матывы. Паслякастр. паэзія, прасякнутая шчырым лірызмам, апявае працоўныя будні сав. людзей, дружбу народаў, бел. прыроду. Аўтар зб. «Барвёнак» (1924), «Спатканні» (1925), «Сузор'і» (1926), «Зорнасць» (1927), «Межы» (1929). Сямейнабытавая лірычная драма «Любоў усё змагае» (нап. 1912) — першая бел. п'еса ў вершах. Перакл. творы Ф. Гладкова, І. Садоф'ева і інш.



Тв.: Выбраныя творы, Мн., 1950; Вершы, Мн., 1953.

Літ.: Аглевіч У. Літаратура і жыццё, Мн., 1954, с. 133—139; Алесь Гурло. [Некралог], «Полымя рэвалюцыі», 1938, № 2; Хведаровіч М. Памятныя сустрэчы, 2 выд., Мн., 1963, с. 86—113.

С. Х. Александровіч. Мінск.

ГУРМАН (франц. gourmand), аматар і знаўца вытанчанай стравы; пераносна — ласун, абжора.

ГУРНОФЕЛЬ, вёска ў Касцянёўскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр саўгаса «Шчучынскі». За 22 *км* на ПнУ ад Шчучына, 80 *км* ад Гродна, 12 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 218 ж., гасп. 77 (1971). Лясніцтва, майстэрня для рамонту с.-г. тэхнікі. Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

ГУРНЫ Уладзімір Барысавіч (н. 11.11.1941, с. Тоцкае Тоцкага р-на Чкалаўскай вобл.), беларускі спартсмен, майстар спорту СССР міжнар. класа (1966) па парашутным спорце. Чэмпіён свету ў групавым скачку з парашутам і ў камандным заліку (1966, Лейпцыг, ГДР); у акрабатычных скачках з парашутам (1968, г. Грац, Аўстрыя). Шматразовы рэкардсмен свету (33 разы) і Сав. Саюза (35 разоў) у групавых скачках парашутыстаў. Скончыў Бел. дзярж. ін-т фіз. культуры (1962). Інструктар парашутнага спорту (1971) Мінскага аэраклуба ДТСААФ. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.



ГУРСКІ Ілья Данілавіч [н. 14(26).4.1899, в. Замосце Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі пісьменнік. Засл. дз. культ. БССР (1969). Чл. КПСС з 1919. З сялян. Парабкаваў, працаваў на Абухаўскім з-дзе ў Петраградзе. Удзельнічаў у грамадз. вайне. У 1924—32 працаваў у Галоўрэперткоме, потым у Галоўмастацтве БССР. Скончыў БДУ (1932). У 1935—41 рэдактар газ. «Літаратура і мастацтва», у Айч. вайну — газ. «За свабодную Беларусь» і сатыр. лістка «Партызанская дубінка», у 1944—60 — час. «Беларусь». Пачаў літ. дзейнасць як драматург. Аўтар п'ес «Новым шляхам», «Дрыгва» (1928), «Качагары» (1930), «Новы горад» (1932), «Маці» (1934), «Свае людзі» (1950), «Хлеб» (1948). Асн. тэмы паслявае. творчасці: барацьба з ням.-фаш. захопнікамі (апавяданні, аповесць «Лясныя салдаты», 1945; раман «У агні», 1952), Кастр. рэв. у Петраградзе, на Зах. фронце і на Беларусі (раман «Вецер веку», 1966). У рамане «Чужы хлеб» (1969) выкрывае бел. бурж. нацыяналістаў. Творы Г. перакладаліся на рус., укр. і інш. мовы. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Над Нёманам, Мн., 1945; Выбраныя творы, Мн., 1951; У вялікай дарозе, Мн., 1958; Родная дарога, Мн., 1961; На берагах Нявы, Мн., 1968; Праца красіць і славіць, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Герцовіч Я. Вернасць прызванню, «Полымя», 1969, № 4.

Я. Н. Рапановіч. Мінск.

ГУРСКІ Канстанцін Іванавіч [8(21).11.1907, в. Свінка Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 17.2. 1943], беларускі савецкі моваznавец. Канд. філал. н. (1939). Скончыў БДУ (1933). Працаваў заг. Рагачоўскага райана (1933—36), вучоным сакратаром Ін-та мовы і л-ры АН БССР і заг. кафедры бел. мовы Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага (1939—41). Аўтар арт. «Аб беларускім правапісе» (1938), «Граматычныя катэгорыі дзеяслова і іх выражэнне ў беларускай мове» (1940), «Выказнік у беларускай мове» (1940). Сааўтар «Сінтаксісу беларускай мовы» (1939) і «Курса сучаснай беларускай

мовы» (1940). Удзельнік Айч. вайны, загінуў пад Арлом.

ГУРСКІ Мікалай Іванавіч [н. 22.5(4.6).1905, в. Свінка Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі мовазнавец. Канд. філал. н. (1950), праф. Мінскага пед. ін-та (з 1962). Чл. КПСС з 1959. З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага (1937). Удзельнік Айч. вайны. Працаваў у БДУ (1938—41). Аўтар падручніка для студэнтаў пед. ін-таў «Параўнальная граматыка рускай і беларускай моў» (1962). Сааўтар падручнікаў: «Беларуская мова» (ч. 1—2, 1955—58) для пед. вучылішчаў і дапаможнік для пед. ін-таў; «Беларуская мова» (ч. 1—2, 1961—62) для ф-та пач. школ пед. ін-таў; «Руская мова» (ч. 1—2, 1962—65) для ф-та падрыхтоўкі настаўнікаў пач. класаў пед. ін-таў; «Руская мова» (ч. 1—2, 1965—69) для сярэдняй школы.

ГУРТ (у беларускім музычным фальклоры), устойлівы ансамбль з некалькіх творча раўнапраўных спевакоў. Пашыраны пераважна ў паўд. раёнах Беларусі.

ГУРТАВОЙ Цімафей Іванавіч (н. 23.2.1919, пас. Грыгаропаль, цяпер Малд. ССР), малдаўскі савецкі дырыжор. Нар. арт. СССР (1967). Чл. КПСС з 1951. У 1949 скончыў Кішынёўскую кансерваторыю. У 1951—53 маст. кіраўнік Малд. філармоніі, з 1953 гал. дырыжор Малд. сімф. аркестра. Актыўна прапагандуе нац. музыку. У 1960 кіраваў першай пастаноўкай оперы «Сэрца Домнікі» А. Стырчы ў Малд. т-ры оперы і балета. З 1949 выкладае ў Кішынёўскай кансерваторыі (з 1963 ін-т мастацтваў імя Музічэску). Дэп. Вярх. Савета СССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ГУРЫШ Антон Іосіфавіч [15(28).9.1910, в. Шпількі Мінскага пав.— 22.10.1962], Герой Сав. Саюза (1945), контр-адмірал (1951). З сялян. Чл. КПСС з 1938.



Скончыў Ваен.-марскую акадэмію імя Варашылава (1948). У ВМФ з 1928. У Айч. вайну на Паўн. флоце—камандзір эскадранага мінаносца і дывізіёна эскадраных мінаносцаў. Удзельнічаў у 18 аперацыях, праводзіў 95 транспартаў, камандаваў 10 аперацыямі па канваіраванні транспартаў і ў аперацыях па пошуку варожых падводных лодак. З 1948 нач. штаба і камандзір злучэння караблёў. У 1955—62 нам. нач. і нач. кафедры Ваен.-марской акадэміі.

ГУРЫНОВІЧ Адам Гіляры Калікставіч [13(25).1.1869, фальварак Кавалькі Вілейскага пав. Віленскай губ.— 14(26).1.1894, па інш. крыніцах 17(29).1.1894], беларускі паэт-дэмакрат, рэвалюцыянер. Сын збяднелага шляхціца. Скончыў Віленскае рэальнае вуч. (1887). Вучыўся ў Пецярбургскім тэхнал. ін-це (1887—93). Член, потым старшыня створанага ў 1889 нелегальнага «Гуртка моладзі польска-літоўскай, беларускай і малярускай», які аб'ядноўваў студэнтаў шэрагу ВНУ Пецярбурга і прапагандаваў сярод рабочых і сялян ідэі марксізма. Гурток быў звязаны з Г. В. Пляханавым і яго групай «Вызваленне працы», з укр. пісьменнікам, рэвалюцыянерам-дэмакратам І. Франко. 16.6.1893 арыштаваны ў Вільні і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Выпушчаны з-за хваробы, сасланы пад нагляд паліцыі ў Крыстынопаль Свянцянскага пав. Віленскай губ., дзе памёр ад чорнай воспы. Г. быў матэрыялістам і атэістам. На яго поглядах адбіўся ідэйны ўплыў рускай матэрыялісц. філасофіі. У процілегласць рэліг. аскетызму, пакорлівасці і веры ў тагасветнае жыццё Г. быў аптымістам, барацьбітом супраць усякага, у тым ліку і рэліг., прыгнёту. Яго палітычным і грамадскім ідэалам быў утапічны сацыялізм і дэмакр. рэспубліка, дзе не будзе ні багатых, ні бедных, ні эксплуатацыі чалавека чалавекам. Пад уплывам «Капітала» К. Маркса і інш. марксісцкай л-ры Г. прыйшоў да вываду аб магчымасці «жыццёвага дапасавання» сацыяліст. ідэй, пераўтварэння рэвалюц. шляхам тагачаснага грамадска-паліт. ладу. Г. упершыню ў бел. літаратуры выказаўся аб агульнасці інтарэсаў рабочых і сялян у барацьбе з іх класавымі ворагамі. Як паэт далучаўся да крытычнага рэалізму Ф. Багушэвіча. Пісаў на бел., польскай і рус. мовах. Паэт. творы Г. ўпершыню апубл. ў 1921. Збіраў бел. фальклор («Зборнік беларускіх твораў...», 1893) і некат. этнаграфічныя матэрыялы. Перакладаў на бел. мову асобныя творы А. Пушкіна, І. Крылова, М. Някрасава, А. К. Талстога, А. Міцкевіча, Я. Каспровіча, Э. Ажэшкі, І. Франка. Паэзія Г. пераважна грамадз. складу, рэвалюц. заклікаў (вершы «Перш душылі паны», «Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею», «Што ты спіш, мужычок», «Бор»). Адзін з пачынальнікаў у бел. л-ры элегічна-пейзажнай, песенна-фальклорнай лірыкі, жанраў балады і байкі.

Тв. У кн.: Беларускія пісьменнікі другой паловы XIX ст. Зб. тэкстаў, Мн., 1956.

Літ.: Майхровіч С. К. Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя, Мн., 1957; Лушчыкі І. М. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX веку, Мн., 1958; Ларчанка М. Па шляху рэалізма, Мн., 1959; Шутовіч Я. Адам Гурыновіч. Паводле старых і новых архіўных матэрыялаў, «Полымя», 1966, № 11; Саламевіч Я. Адам Гурыновіч — фальклярыст, «Полымя», 1969, № 1.

І. М. Лушчыцкі. Мінск.

ГУРЫНОВІЧ Анатоль Емяльянавіч (н. 9.9. 1924, в. Слатвін Чэрвеньскага р-на Мінскай акр.), дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1948. Скончыў Беларускі ін-т нар. гасп. імя Куйбышава (1949), Вышэйшую дыпламат. школу МЗС СССР (1951). З 1941 сувязны Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б; з 1943

партызан атрада «Радзіма» брыгады «Разгром» Мінскай вобл. У 1944—45 на сав. і гасп. рабоце. З 1951 у Мін-ве замежных спраў БССР. У 1957—61 на рабоце ў Прадстаўніцтвах СССР і БССР пры ААН, заг. аддзела міжнар. эканам. арг-цый МЗС БССР; з вер. 1961 нам. міністра, з мая 1966 міністр замежных спраў БССР. Узначальваў дэлегацыі БССР на XXI (1966), XXIII (1968), XXIV (1969), XXV (1970) сесіях Ген. Асамблеі ААН. На XXVII з'ездзе КПБ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 7—8-га скл. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ГУРЫНОВІЧ Георгій Паўлавіч (н. 26.4.1933, г. Барысаў), беларускі савецкі фізік. Чл.-кар. АН БССР (1970). Д-р фіз.-матэм. н. (1969), праф. (1970). Чл. КПСС з 1964. Скончыў у 1956 БДУ. З 1959 працуе ў Ін-це фізікі АН БССР, з 1965 загадчык лабараторыі фотахіміі; адначасова па пед. рабоце ў БДУ (з 1963). Асн. навук. працы ў галіне спектраскапіі і фотахіміі хларафілу і яго папярэднікаў і аналагаў — парфірынаў. Выявіў залежнасць ступені палярызацыі люмінесцэнцыі ад даўжыні хвалі выпрамянення. З супрацоўнікамі даследаваў антыстоксаву люмінесцэнцыю, распрацаваў метады спектраскапічнага даследавання і вызначыў квантавыя выхады ўсіх асн. стадый фотарэакцый малекул хларафільнага тыпу. Працы Г. садзейнічаюць пранікненню фіз. метадаў даследавання ў біялогію і хімію.



Тв.: (Разам з А. Н. Сеўчанкам і К. М. Салаўёвым) Спектроскопия хлорофилла и родственных соединений, Мн., 1968.

ГУРЫНЫ, вёска ў Бібікаўскім с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Уперад». За 12 км на ПдУ ад Мазыра, 145 км ад Гомеля, 10 км ад чыг. ст. Козенкі, 6 км ад Прыпяці. 411 ж., дваroў 117 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, швейная майстэрня, магазін.

ГУРЭВІЧ Сямён Шоламавіч [н. 7(20).12.1915, г. Ігумен Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1935. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У Айч. вайну абараняў Мінск, Магілёў. Ваяваў на Зах., Сцяпным, 2-м і 1-м Укр. франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на Пн ад Дняпрадзяржынска. Ноччу 25.9.1943 з 4 сувязістамі фарсіраваў раку, наладзіў сувязь з палком, які вёў бой за плацдарм. Жыве ў Мінску.



ГУР'ЯНАЎ Павел Якаўлевіч (1918, г. Спаск Казанскай губ.— 1960), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942, камандзір аддз. сувязі. Вызначыўся 24.9.1943 у Камарынскім р-не Палескай вобл. Уначы пераправіў аддзяленне на правы бераг Дняпра, наладзіў сувязь і гэтым забяспечыў штабу дывізіі бесперапыннае кіраванне фарсіраваннем ракі.

ГУС (Hus) Ян (1371, мяст. Гусінец, Паўд. Чэхія — 6.7.1415, Канстанца), мысліцель, заснавальнік і ідэолаг ранняй чэшскай Рэфармацыі, нац. герой чэшскага народа. З сялян. Скончыў Пражскі ун-т (1393), пазней выкладаў у ім, быў дэканам і рэктарам. З 1402 прапаведнік у Віфлеемскай капліцы ў Празе. Выступаў супраць ням. панавання ў Чэхіі, выкрываў злоўжыванні і маральны заняпад каталіцкага духавенства, патрабаваў секулярызацыі царк. зямель. Г. не заклікаў да знішчэння феад. ладу, але яго асн. патрабаванні сталі лозунгамі *гусіцкага рэвалюцыйнага руху*. Пераклаў на чэш. мову Біблію, удасканаліў сістэму чэш. арфаграфіі. У 1412 адлучаны ад царквы. Выкліканы на царк. сабор у Канстанцу (1414), аб'яўлены ерэтыком і паводле пастановы сабору спалены.



Тв.: Рус. пер.— Послания магистра Иоанна Гуса..., М., 1903.

Літ.: Рубцов Б. Т. Ян Гус, М., 1958; Кратохвил М. В. Ян Гус, пер. с чеш., М., 1959.

ГУСАК (Husák) Густаў (н. 10.1.1913, в. Доўбраўда, каля Браціслявы), паліт. і дзярж. дзеяч Чэхаславакіі. З беднай сялянскай сям'і. Па адукацыі юрыст. Рана ўключыўся ў рэвалюц. рух. З 16 гадоў чл. камсамола, з 20 чл. кампартыі. Пасля забароны ў 1938 КПЧ і ліквідацыі Чэхаславацкай Рэспублікі працаваў у падполлі, уваходзіў у кіраўніцтва парт. арг-цыі Браціслявы. Няраз арыштоўваўся. У 1943 удзельнічаў у стварэнні нелегальнага, 5-га па ліку, ЦК КП Славакіі, стаў адным з кіраўнікоў славацкага Руху Супраціўлення, потым Славацкага нац. паўстання 1944. Пасля вызвалення краіны чл. ЦК КПЧ і ЦК КПС, чл. Прэзідыума і сакратарыята ЦК КПС, быў на розных дзярж. пасадах. У лют. 1951 Г. беспадстаўна абвінавачаны і зняволены. У маі 1960 вызвалены, у 1963 рашэннем ЦК КПЧ рэабілітаваны. Працаваў у Славацкай АН, стаў кандыдатам гістар. навук. У крас. 1968 прызначаны нам. старшыні ўрада ЧССР, у жн. 1968 выбраны першым са-



кратаром ЦК КПС. З 31 жн. 1968 чл. ЦК КПЧ, яго Прэзідыума, а потым Выканаўчага к-та Прэзідыума ЦК КПЧ. 17 крас. 1969 выбраны першым сакратаром ЦК КПЧ. Вядзе наступоўную барацьбу за ўмацаванне пазіцый сацыялізма ў ЧССР, за ўмацаванне адзінства міжнар. камуніст. і рабочага руху на прынцыпах марксізма-ленінізма. Узначальваў дэлегацыі КПЧ на Нарадзе камуніст. і рабочых партый 1969 у Маскве і на XXIV з'ездзе КПСС. Герой ЧССР.


Тв.: Рус. пер.— Избранные статьи и речи, М., 1969; Свидетельство о Словацком национальном восстании, М., 1969.

ГУСАК Сяргей Адамавіч (2.4.1930, в. Іванкаўшчына Мазырскага р-на — 10.12.1969), беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец. Чл. КПСС з 1959. Канд. філал. н. (1966). З сям. Скончыў філал. ф-т ВДУ (1955). Настаўнічаў (1955—59). У 1961—65 нач. навуч.-метадычнага аддзела Мін-ва асветы БССР. У 1965—68 працаваў у ВДУ, з кастр. 1968 рэктар Брэсцкага пед. ін-та. Друкавацца пачаў у 1961. Даследаваў праблемы сучаснай бел. прозы.

Тв.: Алексей Кулаковский, Мн., 1967; Духоўны свет герояў, «Маладосць», 1962, № 3; Шляхам жыцця, там жа, 1967, № 11.

ГУСАКОЎ Аркадзь Уласавіч (н. 14.8.1918, в. Уклянціна Віцебскага пав.), гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1943. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. У 1944—59 у сав. органах у Шумілінскім, Любанскім, Клічаўскім, Слуцкім р-нах. У 1959—67 старшыня калгаса імя Дзяржынскага Слуцкага р-на Мінскай вобл. З 1967 у Мін-ве хлебапрадуктаў БССР, з 1971 у сістэме Мін-ва гандлю БССР. На XXVI з'ездзе КПБ выбраны чл. Рэвізійнай камісіі КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ГУСАКОЎСКІ Іосіф Іракліевіч [н. 12(25).12. 1904, в. Вародзькава Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.], генерал арміі (1968). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Ваен. кавалерыйскую школу (1931), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1948). У Чырвонай Арміі з кастрычніка 1928. З 3.7. 1941 удзельнік Айч. вайны на Зах., Варонежскім, 1-м Укр., 1-м і 2-м Бел. франтах. Удзельнік баёў пад Масквою, вызвалення Тулы, Калугі, Курска, Кіева, Перамышля, Сандаміра, Любліна, Данцыга, Гдыні, штурму Берліна; фарсіравання Дняпра, Дыястра, Буга, Віслы, Варты, Одэра. Брыгада, якою камандаваў Г., вызначылася пры прарыве абароны ворага на Львоўскім напрамку, акружэнні і знішчэнні бродскай групоўкі ворага, фарсіраванні Сана, Віслы, Піліцы і вызваленні г. Ловіча (Польшча). Пасля Айч. вайны ў Сав. Арміі. З 1959



камандуючы войск Прыбалт. ваен. акругі, з 1963 нач. Гал. ўпраўлення кадраў Мін-ва абароны, з 1970 у групе генеральных інспектараў Мін-ва абароны СССР. Дэп. Вярх. Савета СССР 6 і 7-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, 3 ордэнамі МНР і ПНР, медалямі. У Магілёве ўстаноўлены бюст.

У. А. Пурын. Масква.

ГУСАРАЎ Мікалай Іванавіч [н. 21.7(3.8). 1905, Слабада Нікалаеўская Цараўскага пав, Астраханскай губ.], савецкі парт. дзеяч. З рабочых. Чл. КПСС з 1925.



Прац. дзейнасць пачаў з 11 гадоў. Да 1919 парабкаваў. У 1922—27 на камсамольскай рабоце, адказны сакратар Хапёрскага акруговага к-та ВЛКСМ у г. Урупінску. У 1927—29 у Чырв. Арміі, у 1929—30 на газетнай рабоце. З 1931 да 1933 і ў 1937—38 вучыўся ў Маскоўскім авіяц. ін-це. З 1938 другі сакратар Свярдлоўскага гаркома, у 1938—46 першы сакратар Молатаўскага абкома ВКП(б); у 1946—47 інспектар Сакратарыята ЦК ВКП(б). З 7.3.1947 да 31.5.1950 першы сакратар ЦК КП(б) Беларусі. На XVIII з'ездзе ВКП(б) выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 1 і 2-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў Маскве.

ГУСАРЖЭЎСКІ Тамаш (1732—1807), прадстаўнік асветніцкага кірунку ў гістар. навуцы Польшчы, Літвы і Беларусі. Праф. усеагульнай гісторыі Віленскага ун-та. Прааналізаваў феад. тэалагічнай гістарыяграфіі рацыяналістычнае разуменне гісторыі. На думку Г., вывучэнне гісторыі мае пазнавальныя і маральна-паліт. мэты, таму трэба даследаваць найперш прычыны росквіту і падзення дзяржаў, палітыку і культуру, норавы і звычаі народаў. Аднак Г. поўнасцю не парваў з феад. ідэалогіяй і часам спрабаваў прымірыць рацыяналістычнае і рэліг. тлумачэнне гісторыі. Пед. дзейнасць Г. садзейнічала пашырэнню ў Польшчы, Літве і на Беларусі асветн. ідэй.

Тв.: Mowa na zaczęciu lekcyj publicznych historii powszechnej na zgromadzeniu publicznym dnia 22.XI. 1784 r. miana, Wilno, 1784; Raport prof. Tomasza Hussarzewskiego o kursie historii starożytnej w. r. akad. 1802/3, Wilno, 1930.

Літ.: Leśnodorski B. Dzieło sejmu czteroletniego, Wrocław, 1951; Serejski M. H. Koncepcja historii powszechnej Joachima Lelewela, Warszawa, 1958.

А. А. Вірала. Мінск.

ГУСАРКА, вёска ў Клімавіцкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Клімавіцкі». За 7 *км* на ПнУ ад Клімавіч, 131 *км* ад Магілёва, 10 *км* ад чыг. ст. Клімавічы. 158 ж., двароў 45 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У кастр. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 299 землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

«ГУСАРЫ», беларускі народны танец, характарам блізкі да карагода. Выканаўцы ходзяць, узяўшыся за рукі і спяваючы песню, ствараюць розныя фігуры: змейку, круг, вароты і інш. Тэмп павольны, муз. памер $^2/_4$.

«ГУСАЧОК», беларускі народны танец, блізкі да карагода. Выканаўцы ходзяць адзін за адным, імітуючы гусіную чародку. Тэмп павольны, муз. памер $^2/_4$.

ГУСЕЙН МЕХТЫ [сапр. Гусейнаў Мехты Алі аглы; 22.3(4.4).1909, с. Шыхлы Казахскага пав. Елізаветпольскай губ.— 10.3.1965], азербайджанскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1941. Сын настаўніка. Скончыў Азерб. ун-т (1930). Друкавацца пачаў у 1927. У ранніх апавяд. пакаазае азерб. вёску першых паслярэвалюц. гадоў. Раман «Паводка» (1933—36) і аповесць «Тарлан» (1940) пра змаганне за Сав. ўладу ў Азербайджане. У Айч. вайну напісаў аповесць «Кліч», апавяд. «Кветкі», «Крывавая вада» і інш., п'есу «Чаканне» (з І. Эфендыевым). Тэма іх — патрыятызм, гераізм і самаахвярнасць сав. людзей на фронце і ў тыле. Аўтар гістар. драмы «Джаванширы» і аповесці «Камісар» — першага твора ў азерб. л-ры пра аднаго з 26 бакінскіх камісараў Мешадзі Азізбекава. У рамане «Апшэрон» (1947, Дзярж. прэмія СССР 1950, працяг «Чорныя скалы», 1957) даў шырокую панараму жыцця бакінскіх нафтавікоў. Гістар. раман «Раніца» (ч. 1—2, 1950—53) пра рэвалюц. барацьбу бакінскіх рабочых, ролю народа ў гісторыі; п'еса «Полымя» (1961) пра маральную чысціню сав. людзей. Апошні твор Г. М. аповесць «Падземныя рэкі цякуць у мора» (выд. 1966). Выступаў таксама як крытык.

Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., М., 1959; Могучее содружество, Баку, 1964; Апшерон.— Схватка, М., 1969; Утро, М., 1970; Повести. Рассказы. Пьесы, М., 1971.

А. С. Гусейнаў. Баку.

ГУСЕЛЬНІКАВА Ніна Іванаўна (н. 2.10. 1924, Ніжні Ноўгарад), беларуская і руская савецкая спявачка (лірыка-каларатурнае сапрано). Засл. арт. БССР (1951). Чл. КПСС з 1962. Скончыла Бел. кансерваторыю (1950). У 1949—52 салістка Бел. т-ра оперы і балета, стварыла на яго сцэне вобразы Антаніды («Іван Сусанін» М. Глінкі), Марфы («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Дуні («Марозка» М. Красева), Віялеты, Джыльды («Травіята» і «Рыгалета» Дж. Вердзі), Мікаэлы («Кармэн» Ж. Бізэ), Лакме («Лакме» Л. Дэліба). Лаўрэат (1-я прэмія) конкурсаў II Сусв. кангрэсу студэнтаў (Прага, 1950) і III Сусв. фестывалю моладзі і студэнтаў (Берлін, 1951). У 1952—64 салістка Вял. т-ра СССР, з 1964 Маск. канцэртнай арг-цыі.

ГУСЕНІЧНЫ ХОД, хадавая частка некаторых машын (танкаў, трактароў) ці прычэпаў. Складаецца з шматзвеннага замкнёнага ланцуга, па ўнутр. паверхні якога перакочваюцца апорныя каткі. Павялічвае счапленне з грунтам і праходнасць машын. Г. х. у самаходных машынах адначасова і *рухальнік*.

ГУСЕПАДОБНЫЯ (Anseriformes), атрад водаплаўных птушак. Пашыраны на ўсім зямным шары (акрамя Антарктыды). Два надатрады: паламедэі (Anhimae, 3 віды, жывуць у Паўд. Амерыцы) і пласціністадзюбыя (Lamellirostres, 142 віды). Апошні надатрад мае 1 сям. Anatidae, у ім 3 падсям.: гусіныя — Anserinae, качыныя — Anatinae і паўланчатыя гусі (Anseranatinae). У СССР 58 відаў, на Беларусі — 30: лебедзь-клікун, *шэрая гусь, крыжанка, вогаль*, чырвананосы нырэц, вялікі крохаль і інш.

Цела Г. укрыта густым пухам і пер'ем. Даўж. 38—180 *см*, маса 0,2—13,6 *кг*. Г.— вывадкавыя птушкі. Жывуць на ўзбярэжжах марскіх і ўнутраных вадаёмаў. Нясуць 2—15 яец. Кормяцца расліннай і жывёльнай ядою. Многія маюць прамысл. значэнне. Гл. таксама *Гусі свойскія*.

Літ.: Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

ГУСЕРЛЬ (Husserl) Эдмунд (8.4.1859—26.4. 1938), нямецкі філосаф-ідэаліст, пачынальнік фенаменалагічнай школы бурж. філасофіі. Фенаменалогія Г.— разнавіднасць суб'ектыўна-ідэалістычнага (з элементамі аб'ектыўнага ідэалізму) разумення спецыфікі адносін суб'екта і аб'екта пазнання. Аб'ектыўная рэальнасць, паводле Г., не існуе па-за накіраванай на яе свядомасцю суб'екта. Крытэрый існіны — асабістыя перажыванні суб'екта. Ідэі Г. сталі філас. асновай *экзістэнцыялізму*.

Тв.: Рус. пер.— Логические исследования, т. 1, СПб., 1909.

ГУСЕЎ Валянцін Іванавіч [н. 23.4(6.5).1911, в. Александрыя Стаўрапольскага краю], беларускі савецкі архітэктар. Засл. арх. БССР (1969). Вучыўся ў Маск. арх. ін-це (1932—36) у В. Весніна. З 1936 працуе на Беларусі. Удзельнік Айч. вайны. У 1953—58 нам. старшыні Дзярж. камітэта па справах буд-ва і архітэктуры Савета Міністраў БССР. Распрацаваў праекты Дома Чырв. Арміі ў Бабруйску (1937—38), муз. ф-кі ў Барысаве (1937), шэрагу пасёлкаў (1938—40), гал. карпусоў штаба Бел. ваен. акругі (1946—47) і Упраўлення Бел. чыгункі (1951) у Мінску, праспекта Кірава ў Віцебску (1951—56, з В. і А. Данілавымі). Выкладчык Бел. політэхн. ін-та (1936—59, з перапынкамі, дацэнт з 1958) і Бел. тэатр.-маст. ін-та (з 1959, з 1964 заг. кафедры інтэр'ера і абсталявання). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

ГУСЕЎ Васіль Фёдаравіч [н. 3(16).1.1905, Чарнігаў], савецкі вучоны ў галіне ветэрынары. Д-р вет. н., праф. (1968). Чл. КПСС з 1942. Скончыў Ленінградскі вет. ін-т (1931). Заг. аддзела паразіталогіі (1933—34), заг. протазаалагічнай лабараторыі (1948—52) Бел. н.-д. вет. ін-та, старшы навук. супрацоўнік Ін-та жывёлагадоўлі АН БССР (1951—53). З 1955 дырэктар Ленінградскага н.-д. вет. ін-та, з 1964 — Усесаюзнага НДІ па хваробах птушак. Асн. працы па тэрапіі гемаспарыдыёзаў коней і буйн. раг. жывёлы, па відавым складзе, геагр. пашырэнні, біялогіі і экалогіі іксодавых кляшчоў.

Тв.: Новые методы борьбы с клещами. I. ricinus и D. pictus в условиях Белорусской ССР, у кн.: Тезисы докладов на первой Всесоюзной конференции по проблемам ветеринарной дерматологии, арахнологии и энтомологии, М., 1954; К изучению терапии при пироплазмозе лошадей и бабезиеллезе крупного рогатого скота тиаргеном, гемоспоридином и бигумалем в условиях Белорусской ССР, у кн.: Протозойные болезни сельскохозяйственных животных, М., 1955.

ГУСЕЎ Веньямін Васілевіч [н. 8(21).2.1917, в. Галубы Вятлужскага пав. Ніжагародскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1939. На фронце з 1941. Рота пад камандаваннем Г. вызначылася 22—24.6.1944 у час прарыву абароны праціўніка на тэр. Сіроцінскага р-на Віцебскай вобл.; фарсіравала Зах. Дзвіну, выбіла ворага з траншэй, знішчыла 4 кулямётныя кропкі, адбіла 2 контратакі. 3.7.1944 рота вызначылася ў баях за вызваленне Полацка. Жыве ў г. Ліепая Латв. ССР.

ГУСЕЎ Мацвей Мацвеевіч [14(26).11.1826, Вятка — 10(22).4.1866], рускі астраном. Скончыў у 1847 Казанскі ун-т. Працаваў у Пулкаўскай абсерваторыі (1850—52). З 1852 памочнік дырэктара *Віленскай астранамічнай абсерваторыі*, дзе адным з першых у свеце арганізаваў сістэматычнае фатаграфаванне сонечных плям і паверхні Месяца з мэтай даследавання фіз. з'яў на гэтых свяцілах. Вывучаў таксама ўласныя рухі зорак. Аўтар гістар. агляду стогадовай работы (1753—1853) Віленскай абсерваторыі. Выдаваў у 1860—63 першы ў Расіі часопіс па дакладным прыродазнаўстве «Вестник математических наук».

Літ.: Лаврова Н. Б. [скл.]. Библиография русской астрономической литературы 1800—1900 гг., М., 1968 (Труды Гос. астроном. ин-та им. П. К. Штернберга, т. 37); Перель Ю. Г. Матвей Матвеевич Гусев. «Астрономический журнал», 1952, т. 29, в. 4.

ГУСЕЎ Сіла Нічыпаравіч [н. 31.7(12.8).1897, в. Калясянка Чавускага пав. Магілёўскай губ.], удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў, пісьменнік. З сялян. Чл. КПСС з 1924. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Мінску (1934). З 1913 на ф-цы ў Пецярбурзе. З 1916 у арміі. Удзельнік Лют. і Кастр. рэв., штурму Зімняга палаца. У складзе 1-га Чавускага рэвалюц. атрада змагаўся з легіянерамі Доўбар-Мусніцкага ў Чавускім, Быхаўскім і Магілёўскім пав. У 1920—22 на Дняпроўскай ваен. флатыліі, Чарнаморскім ваен. флоце. З 1922 на сав. і гасп. рабоце. З 1934 адзін з рэдактараў альманаха «Атака», літ. аддзела радыёкамітэта БССР. Аўтар аб. апавяданняў і аповесці. Удзельнік Айч. вайны. У 1945—51 вучоны сакратар Бел. дзярж. музея гісторыі Вял. Айч. вайны, у Белпаліграфвыдаце пры Савеце Міністраў БССР. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.


Тв.: За жыццё. Апавяданні, Мн., 1934; Шлях юнака, ч. 1, Мн., 1938. *В. П. Марутка.* Мінск.

ГУСЕЎ Сяргей Іванавіч [Драбкін Якаў Давыдавіч; 1(13).1.1874, г. Сапажок Разанскай губ.— 10.6.1933], прафесійны рэвалюцыянер, савецкі дзярж., парт. і ваенны дзеяч. Чл. КПСС з 1896. Чл. *Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа»*, агент «Искры». З снеж. 1904 да мая 1905 сакратар Пецярбургскага к-та РСДРП і чл. *Бюро камітэтаў большасці*. Напярэдадні III з'езду партыі пабываў у Паўн.-Зах., Палескім к-тах, Мінскай і Бабруйскай групах РСДРП. Пасля рэв. 1905—07 на парт. рабоце ў Растове, Адэсе, Маскве, Пецярбурзе. З 1918 на ваен.-паліт. рабоце ў Чырв. Арміі. Чл. РВС Усх., Паўд.-Усх. і Паўд. франтоў, чл. РВС Рэспублікі. У 1922—24 чл. РВС Зах. фронту. З 1923 сакратар ЦКК РКП(б). На IX—XI з'ездах РКП(б) выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XII—XVI чл. ЦК. У 1928 канд., 1929—33 чл. Прэзідыума Выканкома Камінтэрна. Аўтар прац па гісторыі, ваен. справе і эканоміцы.

Тв.: Гражданская война и Красная Армия. Сб. ст., М., 1958.

ГУСЕЎ Уладзімір Васілевіч (22.9.1923, станіца Астроўская Камышынскага пав. Саратаўскай губ.— 18.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з жн. 1941. Вызначыўся каля Лоева Гомельскай вобл. 15.10.1943 рота на чале з Г. пад агнём праціўніка фарсіравала Дняпро, выбіла ворага з траншэй, знішчыла некалькі агнявых кропак, захапіла вышыню, адбіла 3 контратакі. Загінуў у баі на плацдарме.

ГУСІ СВОЙСКІЯ, птушкі атр. *гусепадобных*. Паходзяць ад дзікай шэрай гусі (Anser cinereus) і суханоса (Cygnopsis cygnoides). Прыручаны рапей за інш. віды птушак (10—9 ст. да н. э.). Гадуюць у многіх краінах, найболей у СССР.



Мясцовыя беларускія гусі.

Сярэдняя маса гускі 4—8 *кг*, гусака 5—10 *кг*. Пачынаюць несціся ва ўзросце 265—350 дзён. Перыяд яйцаноскасці 4—8 месяцаў. Сярэдняя працягласць племяннога выкарыстання 5—6 гадоў, максімальная 7—8. Некат. гускі нясуцца да 20 гадоў. Найб. пашыраныя на Беларусі пароды: мясцовыя беларускія, вялікія шэрыя, кітайскія, халмагорскія гусі. Каб павысіць прадукцыйнасць Г. с., скрыжоўваюць кітайскіх з вялікімі шэрымі, мясцовымі беларускімі і інш.ародамі. Адна гуска можа даць за год 10—12, а пры добрых умовах кармлення і ўтрымання да 45—50 гусянят (150—180 *кг* мяса).

Літ.: Лобин Н. В. Высокопродуктивное гусеводство, М., 1963; Пенионжкевич Э. Э. и Зеленская К. В. Разведение гусей, 3 изд., М., 1960; Налібоцкі С. Б. Мясцовыя беларускія гусі, Мн., 1962.

В. М. Галушка. Жодзіна.

ГУСІНАЯ ЦЫБУЛЯ (Gagea), род шматгадовых раслін сям. лілейных. Вядома больш за 100 відаў, пашыраных ва ўмераных шыротах Еўропы, Азіі і Паўн. Амерыкі. У СССР каля 80, на Беларусі 8.



Гусіная цыбуля малая.

Нізкарослыя травы з цыбулінай, якая складаецца з аднаго мясістага лістка. Кветкі ад бледна-жоўтага да жоўта-бураватага колеру, сабраныя ў парасона- або шчыткападобныя суквецці, радзей адзіночныя. Плод — трохгнёздая каробачка. Многія віды цвітуць рана ўвесну, а ўлетку губляюць надземныя часткі. На Беларусі найб. вядомыя: Г. ц. жоўтая (G. lutea) і Г. ц. малая (G. minima). Растуць у лясах, хмызняках, на сухадольных лугах, іх добра ядуць жывёлы. Г. ц. жоўтая — лекавая расліна.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны*.

ГУСІЦКІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ, антыфеадальны, нац.-вызв. і антыкаталіцкі рух у Чэхіі ў 1-й пал. 15 ст. Уступам Г. р. р. ў канцы 14 — пач. 15 ст. была ранняя чэшская Рэфармацыя (прадстаўнік Ян *Гус* і нар. прапаведнікі). Штуршком да другога этапа руху, шырокага рэвалюц. выступлення нар. мас паслужыла пакаранне смерцю Гуса (1415). Пачаткам Г. р. р. стала паўстанне ў Празе (30.5.1419) пад кіраўніцтвам Яна Жэліўскага.

Усеаг. абурэнне выклікалі прэтэнзіі на чэшскі трон герм. імператара Сігізмунда I, аднаго з вінаўнікаў смерці Гуса. Паўстанне стала масавае. У першыя месяцы ў Г. р. р. афармілася 2 плыні. Дробныя і сярэднія дваране і гарадскія бюргеры склалі ўмераны лагер чашнікаў, якія патрабавалі ліквідацыі нім. панавання ў Чэхіі, стварэння таннай царквы, прычашчэння хлебам і віном (з чашы — адсюль назва; каталіцкая царква дазваляла прычашчэнне віном толькі духавенству). Сялянства і гар. нізы стварылі рэвалюц. лагер табарытаў (назва паходзіць ад гары Табар, дзе быў створаны ўмацаваны лагер). Яны заклікалі да ўзбр. барацьбы з эксплуататарамі, патрабавалі ліквідацыі феад. парадкаў. Левае крыло табарытаў (хіліясты) адмаўляла ўсякую ўласнасць, было прыхільнікам абагульнення маёмасці. У ліп. 1420 гусіты пад кіраўніцтвам Я. *Жыжкі* перамаглі крыжакоў на Віткавай гары. Гусіты разгромілі яшчэ 4 крыжовыя паходы, арганізаваныя каталіцкай царквой. Пасля смерці Жыжкі (1424) войскам гусітаў кіраваў Прокап Вялікі. Яны вялі не толькі абарончыя войны, паспяховыя былі іх паходы на чужыя тэр. (на герм. землі, у Венгрыю, Польшчу, да Балтыйскага м.). Здрада чашнікаў, іх змова з імператарам Сігізмундам I і папствам паскорылі паражэнне Г. р. р. У маі 1433 аб'яднаныя сілы феад.-каталіцкага лагера і чашнікаў разбілі войска Прокапа Вялікага. Асобныя атрады табарытаў змагаліся да 1437 (Табар захоплены ў 1452).

Нягледзячы на паражэнне, Г. р. р. спрыяў ліквідацыі нім. засілля, захаванню нац. незалежнасці, росту нац. культуры, выклікаў антыкаталіцкі і антыфеад. рух у суседніх краінах, у т. л. на Беларусі. Паміж бел. землямі і Чэхіяй здаўна існавалі эканам. і культ. сувязі. Беларусь была адным з пастаянных спажыўцоў чэшскага сукна; адным з асн. плацежных сродкаў у Вял. кн. Літ. быў чэшскі грош. У Пражскім ун-це ў 14 ст. вучыліся студэнты з Літвы і Беларусі. З рускімі, беларусамі, палякамі, літоўцамі чэхі ўдзельнічалі ў разгроме крыжакоў у *Грунвальдскай бітве 1410*. Гус і яго прыхільнікі глядзелі на суседнія слав. народы як на саюзнікаў у барацьбе. Сведчаннем гэтых планаў было падарожжа аднадумца і паплечніка Гуса — Ераніма Пражскага ў Вял. кн. Літ. У пач. Г. р. р. чашнікі прапанавалі вялікаму кн. Вітаўту заняць чэшскі трон. Пляменнік Вітаўта Зыгмунт Карыбут з 5-тысячным бел.-літ. апалчэннем увайшоў у Прагу (май 1422) і быў каранаваны чэшскім сеймам. Пра пашырэнне ідэй гусізму ў Літве, на Беларусі, польскіх землях сведчыць каралеўскі эдыкт (1424) супраць прыхільнікаў гусізму. Гэтай пастановы было мала, і ў 1436 у Вял. кн. Літ. была ўведзена інквізіцыя. Гусіцкія ідэі мелі вялікі ўплыў на перадавую думку бел. народа, асобных дзеячаў культуры (напр., на Францыска Скарыну, Сымона Буднага і інш.), на правядзенне Рэфармацыі ў Літве і на Беларусі (дзейнасць «Чэшскіх братоў», *антытрынітарыяў*).

Кр.: Лаврентий из Бржезовой. Гуситская хроника, [пер. з чэш.], М., 1962.

Літ.: Архив Маркса и Энгельса, т. 6, Л., 1939; Рубцов Б. Т. Гуситские войны, М., 1955; Сапунов А. Витебская старина, т. 1, Витебск, 1883; Падокшын С. А. Гусізм і грамадскі рух Беларусі і Літвы XV—XVII ст., у кн.: 450 год беларускага кнігадрукавання, Мн., 1968; Мацек Я. Гуситское революционное движение, пер. с чеш., М., 1954; Ярош. Табор в гуситском революционном движении, пер. с чеш., т. 1—2, М., 1956—59; Ruch husycki w Polsce, Wrocław, 1953; Mezinárodni ohlas husitstvi, Praha, 1958. *Н. А. Гусакова.* Мінск.

ГУСЛІ, старажытны струнны шчыпковы музычны інструмент славянскіх народаў. Першыя звесткі пра Г. адносяцца да 6 ст. Былі пашыраны ў Кіеўскай Русі, пазней у Расіі, на Беларусі (пра гэта сведчаць іх выявы ў Радзівілаўскім летапісе, 13 ст.; Аршанскім евангеллі, 14 ст.), Украіне. Разнавіднасці: 1) Г. авончатыя, найб. ранніе, з плоскім трапецападобным корпусам і некалькімі жыльнымі струнамі, якія настроены дыятанічна; 2) Г.-псалтыр, вядомыя з 14 ст., шматструнныя, крылападобнай формы; 3) Г. настольныя («сталовыя»), з 17 ст., мелі большую колькасць храматычна настроеных струн. У аркестрах рус. нар. інструментаў ужываюцца клавішныя Г. з мех. педальным глушніком, вынайдзеныя ў 20 ст. М. Фаміным.



Скамарох, які іграе на гуслях звончатых. Загаловачная літара з Аршанскага евангелля. 14 ст.

ГУСЛІШЧА, вёска ў Вендаражскім с/с Магілёўскага р-на, на р. Лахва. Цэнтр калгаса «Светлы прамень». За 17 *км* на ПдЗ ад Магілёва, 6 *км* ад чыг. ст. Вендрыж. 166 ж., двароў 55 (1971). Цемяранскае лясніцтва Магілёўскага лясгаса, філіял Магілёўскага камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, адда. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГУСОЎСКІ Мікола (каля 1480 — пасля 1533), беларускі паэт-лацініст, адзін з найбуйнейшых славянскіх паэтаў эпохі Адраджэння. Біягр. звестак вельмі мала. Сын лесніка-паляўнічага. Паходзіў, відаць, з тэр. сучаснай Магілёўшчыны. У пач. 1520 у складзе дыпламат. місіі Кароны Польскай трапіў у Рым. Там пачаў пісаць, а дома скончыў паэму на лац. мове «Песня пра зубра» (Кракаў, 1523). Прасякнутая рэнесанснымі, гуманіст. матывамі, яна прынесла аўтару вялікую славу. У паэме Г. апісвае бел. прыроду, заняткі насельніцтва, звычаі, вераванні. Заклікае слав. народы аб'яднацца, каб спыніць тур. агрэсію. У творы шмат бел. народных прыказак і прымавак, выслоўяў жывой нар. мовы, літаральна пераказаных па-латыні. Метафары, эпітэ-

ты, параўнанні, паралелізмы — характэрныя выяўленчыя сродкі бел. песеннага фальклору — Г. ўпершыню ўвёў у літ. ўжытак. Паэма перакл. на польскую, чэш., літ., рус. і інш. мовы. Вядомы і як аўтар панегірычных і рэліг. твораў.

Тв.: Песня пра зубра, пер. Я. Семляжона, «Полымя», 1969, № 6.

Літ.: Голенищев-Кутузов И. Н. Итальянское Возрождение и славянские литературы XV—XVI веков, М., 1963, с. 235—236; Калеснік У. Вяртанне зор, «Полымя», 1971, № 7; Krzyżanowski J. Historia literatury polskiej, 3 wyd., [Warszawa, 1964], с. 100—101; Krókowski J. Mikołaja Hussowskiego «Carmen de bisonte», Wrocław, 1959 (Prace Wrocławskiego Towarzystwa Naukowego. Ser. A, № 65). *М. І. Прашковіч.* Мінск.

ГУСТАТА, возера, вытак р. Густаткі, левага прытока р. Янкі (бас. Зах. Дзвіны), у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,4 *км*². Даўж. 3,1 *км*, найб. шыр. 1,1 *км*, сярэдняя 0,7 *км*. Вадазбор (26 *км*²) злёгку ўзгорысты. Водзяцца карась, плотка, акунь, лінь, шчупак, язь, мянтуз.

ГУСТАТКА, рака, левы прыток р. Янкі (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 26 *км*. Цячэ ў Шаркоўшчынскім р-не Віцебскай вобл. Вадазбор (356 *км*²) у межах Дзісенскай нізіны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2,85 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ГУСТАЎСОН Гаўрыла Гаўрылавіч [22.12.1842(3.1.1843), Пецярбург — 13(26).4.1908], рускі хімік-арганік. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1894). Працы прысвечаны вывучэнню рэакцый падвойнага абмену пры адсутнасці вады і дзеянні галагенных соляў алюмінію на араматычныя і інш. вуглевадароды. Яны спрыялі тлумачэнню рэакцыі Фрыдэля — Крафтса, распрацоўцы прамысл. працэсу крэкінгу ў прысутнасці галагенных соляў алюмінію. Займаўся сінтэзам цыклічных вуглевадародаў.

Літ.: Казанский Б. А., Г. Г. Густавсон, «Успехи химии», 1943, т. 12, в. 4; Пиотровский К. Б. К истории открытия каталитического действия галогенидов алюминия, у кн.: Труды Института истории естествознания и техники АН СССР, т. 12, М., 1956.

ГУСЦЯРА (Blicca bjorkna), рыба сям. карпавых. Водзіцца ў басейнах Паўночнага, Балтыйскага, Чорнага і Каспійскага м. На Беларусі ў Дняпры, Прыпяці, Сажы, Бярэзіне (прыток Дняпра), Зах. Дзвіне, Нёмане, Зах. Бузе і многіх азёрах (пар. назвы: пласкірка, ласкірка, кромп, губар, сухарэбрыца, плётка, сівуха, сцёрка).

Даўж. цела 16—18 *см* (35 *см*), маса каля 100 *г* (бывае да 1,2 *кг*). Падобная да ляшча. Адрозніваецца ад яго двухрадавымі глоткавымі зубамі, плаўнікамі, большай луской. Палавай спеласці дасягае на 4—5-м годзе. Нерастуе ў крас.— ліп. Адкладвае 11—109 тыс. клейкіх ікрынак. Корміцца малюскамі, ракападобнымі, планктоннымі ракападобнымі, радзей водарасцямі. Прамысл. значэнне невялікае.

Літ.: Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965.

ГУСЬКІ, народная гульня з цуркамі (гуськамі) на лёдзе. Гл. *Беларускія народныя гульні*.

ГУСЯЛАПКА (Alchemilla), род шматгадовых травяністых раслін сям. ружакветных. Вядома больш за 1000 відаў, пашыраных на ўсім зямным шары. У СССР каля 240 відаў, на Беларусі 9.



Гусялапка малая.

Сцябло дугападобнае, узнятае, густа ўкрытае валаскамі. Лісце далонерассечанае або лопасцевае, складчатае. Кветкі дробныя, сабраныя ў клубочкі. Найб. пашыраны на Беларусі Г. востраўгольная (A. acutangula, нар. назвы: гусіная лапкі, гаючае зелле, каціныя лапкі, міжперсніца, расічка), Г. пастушынай (A. pastoralis), Г. бліскучая (A. micans) і Г. малая (A. minor). Растуць на лугах, у хмызняках. У каранях і лісці дубільныя і фарбавальныя рэчывы. Лекавыя расліны.

Літ.: Флора БССР, т. 3, Мн., 1950; Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968.

ГУТА, вёска ў Лясянскім с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 29 *км* на ПдЗ ад Баранавіч, 184 *км* ад Брэста, 4 *км* ад чыг. ст. Лясная. 326 ж., гасп. 97 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ГУТАВА, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Сцяг Леніна». За 14 *км* на У ад Драгічына, 124 *км* ад Брэста, 9 *км* ад чыг. ст. Снітава. 726 ж., двароў 210 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ГУТАПЕРЧА (малайск. getah смала+Pertja адна з назваў в-ва Суматра), арган. рэчыва. Ізамер *ізапрэнавага каўчуку*, мае 1,4-трансбудову. Атрымліваюць з соку некат. трапічных раслін. Ужываюць як электраізаляцыйны матэрыял.

ГУТАРАЎ Іван Васілевіч [2(15).4.1906, в. Воўкаўка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 8.2.1967], беларускі савецкі літаратуразнавец і фальклярыст. Чл.-кар. АН БССР (1953). Д-р філал. н. і праф. (1949). Чл. КПСС з 1940. З сялян. Выхаванец Лепенскай школы-камуны імя Леніна. Скончыў БДУ (1928). Выкладаў у Магілёўскім палітасветным і пед. ін-тах (1928—38). Удзельнік партыз. руху на Беларусі. Працаваў заг. аддзела навукі, л-ры і мастацтва Упраўлення прапаганды і агітацыі ЦК КПБ (1947—51), у БДУ, заг. сектара фальклору (1957—67) Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Аўтар даследаванняў па рус. і бел. л-ры, эстэтыцы, бел. фальклоры. Склаў хрэстаматыю «Вуснапаэтычная творчасць беларускага народа» (1959, з С. Васілёнкам), зб. «Сучасны беларускі фальклор» (1963). Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: К. Маркс і Ф. Энгельс пра сутнасць і спецыфіку мастацкай літаратуры, Магілёў, [1933]; Борьба и творчество народных мстителей, Мн., 1949; Поэтическое мастерство В. В. Маяковского, М., 1950; Эстетические основы советской литературы, Мн., 1950; Философско-эстетические взгляды А. С. Пушкина, Мн., 1957; Основы советского литературоведения, 3 изд., Мн., 1967; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967, с. 6—46, 310—324, 344—357.

Літ.: Лыньков М. Кніга аб барацьбе і песні, «Бальшавік Беларусі», 1950, № 4; Бурносаў В. Заўсёды ў творчым пошуку, «Полымя», 1966, № 5.

ГУТАРКА, жанр беларускай літаратуры 19 ст. Мастацка-публіцыстычны, вершаваны ці празаічны, найчасцей ананімны твор, які ставіць вострыя сац. пытанні. Пашыраліся Г. ў сярэдзіне і 2-й пал. 19 ст., асабліва напярэдадні рэформы 1861 і паўстання 1863 (*«Гутарка Данілы са Сцяпанам»*, «Вось цяпер які люд стаў», «Сход», *«Гутарка двух суседаў»*, *«Гутарка старога дзеда»* і інш.). Папулярнасць і сац. дзейснасць Г. выкарыстоўвалі і рэакц. пісьменнікі для прапаганды афіц. ідэй («Прамова Старавойта да сялян аб свабодзе» Ф. Блуса, «Бяседа старога вольніка з новымі пра іхнюю дзела» А. Кісяля). Пасля рэв. 1905, калі бел. л-ра атрымала большыя магчымасці для развіцця, Г. паступова знікае, перадаючы свае функцыі інш. жанрам, ці фальклярызуецца.

Публ. ў кн.: Беларуская літаратура XIX ст., Мн., 1950; Беларуская літаратура XIX ст. Хрэстаматыя, Мн., 1971.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969, с. 27—29, 51—55. *М. А. Лазарук.* Мінск.

«ГУТАРКА ДАНІЛЫ СА СЦЯПАНАМ», твор ананімнай дэмакратычнай беларускай літаратуры 19 ст. Напісана напярэдадні адмены прыгону. Апублікавана П. Шэйнам у час. «Русская старина» (1886, т. 49), М. Федароўскім у кн. «Люд беларускі...» (т. 3, Кракаў, 1903). У мастацка-публіцыст. форме паказвае гаротнае жыццё сялян, шматлікія павіннасці прыгонных. Асобныя мясціны гучаць як горкая скарга людзей, даведзеных да роспачы бязлітаснай эксплуатацыяй. Г. В. Пляханаў цытаваў яе ў арт. «Вызваленне» сялян» (1911), калі гаварыў пра адны і тыя ж думкі ў бел. і рус. соляніна, які чакае адмены прыгону, пра веру соляніна ў тое, што гэтае вызваленне не за гарамі. *М. А. Лазарук.* Мінск.

«ГУТАРКА ДВУХ СУСЕДАЎ», ананімны твор беларускай л-ры 19 ст. Мяркуюць, што аўтарамі яго былі У. Сыракомля і В. Каратынскі. Выдаваўся ў беластоцкай падпольнай друкарні асобнымі выпускамі напярэдадні паўстання 1863. У 1861—62 выйшла 4 нумары. Напісаны ў форме вершаванага дыялогу двух сялян — бывалага, спрактыкаванага Матэвуша і праставатага, наіўнага Юзафа. Па ахвоце і ідэйнай накіраванасці «Г. д. с.» блізкая да *«Гутаркі старога дзеда»*, паасобнымі палажэннямі набліжаецца да «Мужыцкай праўды» і стаіць каля вытокаў бел. дэмакр. прэсы.

Літ.: Революционная Россия и революционная Польша, М., 1967, с. 44—63. *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

«ГУТАРКА СТАРОГА ДЗЕДА», ананімны вершаваны твор беларускай л-ры 19 ст. У навук. л-ры аўтарам гутаркі называлі В. Каратынскага, У. Сыракомлю, В. Дуніна-Марцінкевіча. Напісана ў пач. 1861. Надрукавана Б. Шварцэ, А. Белакозам, Грынявіцкім у беластоцкай падпольнай друкарні напярэдадні паўстання 1863 як агітацыйнае выданне. Вядомы 2 выданні. Каб увесці ў зман цэнзуру, на тытуле аднаго з іх пазначана Познань, другога — Парыж. Публікавалася ў львоўскай газ. «Dziennik literacki» («Літаратурны штодзённік», 1861, № 89), пашыралася таксама ў рукапісах і літаграфічна. Да аднаго з выданняў прыкладзены бел. верш Сыракомлі «Добрыя весці». Выкрывала царскія парадкі, заклікала бел. сялян падтрымліваць польскі вызв. рух. Ідэалізацыя мінулага Рэчы Паспалітай, пропаведзь класавага міру ў імя нац. адзінства сведчаць пра абмежаванасць светапогляду яе складальнікаў — шляхецкіх рэвалюцыянераў.

Літ.: Кісялёў Г. Сейбіты вечнага, Мн., 1963, с. 136—145; Революционная Россия и революционная Польша, М., 1967. *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

ГУТАРЫ Тобіяс Восіпавіч [псеўд. Леа Хело; 16(29).1.1907, в. Муя (Карэлія) — 14.12.1953], карэльскі савецкі паэт. З сялян. Настаўнічаў у сёлах Карэліі (1924—29). Адзін з арганізатараў Карэльскай асацыяцыі пралет. пісьменнікаў. Пісаў на фінскай мове. Друкавацца пачаў у 1927. Аўтар зб. вершаў «Маладыя сэрцы» (1930), «Пераступаю» (1931), «Вершы» (1936), «Песня вясне» (1940), «Мая краіна» (1947) і інш. Пісаў апавяданні, нарысы (зб. «Пераможцы ракі», 1933), кнігі для дзяцей. Пераклаў на фін. мову «Што рабіць?» М. Чарнышэўскага, творы А. Чэхава, М. Горкага, А. Фадзеева, М. Шолахава і інш.

Тв.: Рус. пер.— Избр. стихотворения, М., 1959; Когда озеро цветет. Рассказы и очерки, Петрозаводск, 1964.

Літ.: Очерк истории советской литературы Карелии, Петрозаводск, 1969.

ГУТКОВІЧ Аляксандр Залманавіч (н. 20.1.1920, в. Аскеры Лепельскага пав. Віцебскай губ.), беларускі савецкі драматург і рэжысёр. Чл. КПСС з 1943. У 1942—45 у Сав. Арміі. Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (1949) акцёр Бел. т-ра імя Я. Коласа, з 1957 педагог Бел. т-ра юнага гледача. З 1959 рэжысёр Бел. тэлебачання. Напісаў з Ф. Казоўскай п'есы «Праўда і шчасце» (паст. Брэсцкім т-рам імя ЛКСМБ, 1959) і «Справа не жыцця» (паст. т-рам імя Я. Коласа ў 1961 і Гродзенскім т-рам у 1962), з В. Хазанскім «Юныя мсціўцы» (паст. т-рамі імя Я. Коласа і юнага гледача, 1957). Рэжысёр тэлеспектакляў: «Калі зліваюцца рэкі» паводле П. Броўкі (1961), «Трэцяе пакаленне» паводле К. Чорнага (1964), «Людзі на балоце» паводле І. Мележа (1965, Дзярж. прэмія БССР 1966), «Трывожнае шчасце» паводле І. Шамякіна (1968), тэлефільма «Уся каралеўская рать» (1971). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

ГУТУЗА (Guttuso) Рэната (н. 2.1.1912, Багерыя, Сіцылія), італьянскі жывапісец і графік. Ганаровы чл. Акадэміі маст. СССР (1962). Чл. ІКП, няраз выбіраўся чл. ЦК ІКП. Прадстаўнік сацыяльна-рэаліст. кірунку ў мастацтве сучаснай Італіі. Удзельнік Руху Супраціўлення (1943—45). У 1946—48 лідэр рэаліст. крыла «Новага фронту мастацтваў» (творчае

аб'яднанне мастакоў антыфашыстаў). З вял. сілай выкрывае антыгуманіст. сутнасць фашызму: «Распяцце» (1940—41), серыя малюнкаў «Gott mit uns!» («З намі бог!», 1944). У творах Г. шырока адлюстравана рэвалюц. барацьба італьян. народа («Сяляне ў Сіцыліі займаюць нявыкарыстаныя памешчыцкія землі», 1948—50, і «Бітва каля моста Адмірала», 1951—52), яго сучаснае жыццё («Пляж», 1955—56; «Нядзелл. Калабрыйскі рабочы ў Рыме», 1960—61). Залаты медаль Сусв. Савета Міру за 1950. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Гістарычны жанр* і *Італія*.



Літ.: Барская А. Г. и Русаков Ю. А. (сост.). Ренато Гуттузо, Л.—М., 1965; Берджер Дж. Ренато Гуттузо, пер. с англ., М., 1962.
В. А. Лебедзеў. Масква.

ГУТЭН (Hutten) Ульрых фон (21.4.1488—29.8.1523), нямецкі гуманіст і паліт. дзеяч. Адзін з аўтараў сатыры «Пісьмы цёмных людзей» супраць папства і каталіцкай царквы. У памфлетах выкрываў прагнасць, карыслівасць, разбэшчанасць духавенства. Актыўны прыхільнік Рэфармацыі ў Германіі. Адстойваў ідэю развіцця свецкай адукацыі і культуры. У творчасці карыстаўся метадам рацыяналістычнай крытыкі каталіцкіх догматаў. Грамадскі ідэал Г.— моцная вярхоўная ўлада імператара, якая аберагае прыгонніцкі лад і прывілеі дваранства. Гэта была рэакц. утапічная спроба выратаваць ад разарэння рыцарскае саслоўе, да якога належаў Г. Удзельнічаў у рыцарскім паўстанні 1522, пасля паражэння ўцёк у Швейцарыю, там памёр.

Тв.: Рус. пер.— у кн.: Письма темных людей, М.— Л., 1935; Диалоги. Публицистика. Письма, М., 1959.

Літ.: Володарский В. М. Гуманистические воззрения Ульриха фон Гуттена, у зб.: Средние века, в. 24, М., 1963.

ГУТЭНБЕРГ (Gutenberg) Іаган (1400, Майнц — 3.2.1468), нямецкі вынаходнік, стваральнік еўрап. спосабу друкарства рухомымі металічнымі літарамі. У 1438 засн. друкарню ў Страсбурзе. У 1447 у Майнцы пачаў рэгулярны выпуск невялікіх кніг павучальнага і папулярнага характару, календароў і інш. У 1452—55 надрукаваў лац. біблію ў 2 тамах (42 радкі на старонцы). З 185 экз. біблії вядома 46. У 1455 крэдытор адсудзіў за даўгі ў Г. яго друкарню. Колькасць выдадзеных Г. кніг і паслядоўнасць іх выдання невядомыя.

Літ.: Пятьсот лет после Гутенберга, М., 1968.

ГУЦІЕЎ Мікалай Цімафеевіч [н. 18(31).12.1912, Растоў-на-Доне], беларускі савецкі графік. Засл. дз. маст. БССР (1968). Чл. КПСС з 1947. Вучыўся ў Растоўскім маст. вучылішчы (1934—38) і Маск. паліграфічным ін-це (1955—61). У Айч. вайну ўдзельнічаў у партыз. руху (жн. 1942 — крас. 1944), стварыў больш за 40 антыфаш. плакатаў. З 1945 заг. рэдакцыі выдавецтва «Беларусь». Ілюстрацыі Г. да «Вечароў на хутары ля Дзіканькі» М. Гогаля (1950), «Трагедый» У. Шэкспіра (1954), «Аповесці аб Ясным Стахоры» М. Садковіча (1954), да «Любы Лук'янскай» К. Чорнага (1961), да зб. партыз. паэзіі «Лясныя песні» (1970) і інш. вызначаюцца лаканізмам кампазіцыйнага вырашэння, псіхал. завостранасцю вобразаў, пошукамі новых выяўленчых сродкаў. Асобнае месца ў творчасці Г. займаюць ілюстрацыі да беларускіх казак («Ілюша Іванаў сын», 1965; «Цудоўная дудка», 1967) і інш. Сярод твораў станковай графікі лінагравюры «Смелыя людзі», «Памяць камбрыгаў», «Бой за Пышна» (усе 1970). З 1964 выкладчык Бел. тэатр.-маст. ін-та. У Дзярж. маст. музеі БССР 17 работ Г. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Карыкатура*.



М. Ц. Гуціеў. Вокладка да кнігі «Цудоўная дудка». 1967.


Л. А. Марыкс. Мінск.

ГУЦЭВІЧ (сапр. Stuoka-Gucevičius; Стуока-Гуцявічус Лаўрынас Сімона) Лаўрын [5.8.1753, с. Мігоніс каля Купішак, Літва — 29.11.(10.12).1798], літоўскі архітэктар. Прадстаўнік класіцызму. Удзельнік польскага паўстання 1794. Вучыўся ў Віленскім ун-це (1773—78; праф. у 1793 і 1796—98) у М. Кнакфуса і ў Парыжы (1778—80) у Ж. Ж. Суфло і К. Н. Леду. У 1780 наведаў Рым. Асп. працы ў Вільні: кафедральны сабор св. Станіслава (1777—1801; дабудоўваў М. Шульц), ратуша (1781—99), епіскапскі палац (1792), палац Масальскіх у Верках (Веркяй) каля Вільні (1781). Працы на Беларусі: палац Сапегі ў Дзярэчыне (1786, з Я. С. Бекерам) і касцёл св. Станіслава ў Маляцічах каля Крычава (пабудаваны як копія сабора св. Пятра ў Рыме, паменшаная ў 32 разы; не збярогся).

Літ.: Budrelka E. Architektas Laurynas Stuoka-Gucevičius, Vilnius, 1954.
А. Р. Спельскіс. Вільнюс.

ГУЦЯНКОВА Еўдакія Трафімаўна [н. 14(27).2.1905, в. Сялец Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыла ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1951). У 1927—38 на парт. і прафс. рабоце. З 1938 да 1959 міністр сац. забеспячэння БССР. На XX і XXI з'ездах КПБ выбіралася чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 1—4-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

ГУЧНАГАВАРЫЦЕЛЬ (рэпрадуктар), прылада для ўзнаўлення гуку, які перадаецца па радыё, па правадах ці запісаны на гуканосьбіце. Ператварае эл. ток гукавой частаты ў мех. ваганні, напр. ваганні мембраны.



Г. бываюць электрадынамічныя, электрамагнітныя, п'езаэлектрычныя, пнеўматычныя і тыпу іанафон. Найб. пашыраны электрадынамічны Г. (дынамік). Пастаянны магніт (*2*), у полі якога змяшчаецца шпуля (*1*), сілкуецца пераменным эл. токам гукавой частаты. Мех. ваганні шпулі перадаюцца на дыяфрагму (*3*), якая і выпрамяняе гукавыя хвалі.

ГУЧКОЎ Аляксандр Іванавіч (1862—1936), заснавальнік і лідэр партыі *акцябрыстаў*, буйны капіталіст. Паліт. дзейнасць пачаў у 1905. У 1910—11 старшыня Дзярж. думы, пакінуў гэтую пасаду ў знак пратэсту супраць закону пра земствы ў зах. губернях, які правёў П. А. Сталыпін. З ліст. 1911 старшыня фракцыі акцябрыстаў. У 1915—17 старшыня цэнтр. ваенна-прамысл. к-та, чл. Дзярж. савета і Асобай нарады па абароне. У першым складзе Часовага ўрада — ваенны і марскі міністр [2(15).3—2(15)5.1917]. Адзін з арганізатараў карнілаўшчыны. У 1918 эміграваў у Берлін, выступаў супраць Сав. улады.

ГУЧОК Пётр Іосіфавіч (18.3.1923, в. Лысоўшчына Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 18.4.1945), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў аэраклуб у Мінску (1940), авіяц. вучылішча ў Батайску (1942). На фронце з жн. 1943. Ваяваў на 1, 2 і 4-м Укр. франтах. Зрабіў 209 баявых вылетаў, правёў 56 паветраных баёў, асабіста збіў 20 варожых самалётаў і 3 у групавых баях. Загінуў каля Берліна, пахаваны ў г. Чанстахова (Польшча).



ГУШЧА Васіль Сцяпанавіч (1895, Гомель — 1938), удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў у Туркестане. З рабочых. Чл. КПСС з ліп. 1917. Пасля Кастр. рэвалюцыі заг. ваен. аддзела Самаркандскага абл. Савета, ваенны камісар Самарканда. Арганізатар і камандзір першых атрадаў Чырв. гвардыі і Чырв. Арміі з рабочых і дэхканаў узбекаў. Змагаўся з белагвардзейцамі, басмачамі, з войскамі бухарскага эміра. Адзін з кіраўнікоў разгрому 13 эшалонаў белаказакаў на ст. Растоўцава (Чырвонагвардзейская), ліквідацыі контррэвалюц. мяцяжу ў Ташкенце (студз. 1919). Схіліў на бок Сав. улады тысячы ваеннапалонных з Венгрыі, Аўстрыі, Югаславіі, Германіі і стварыў з іх інтэрнац. чырвонаармейскія падраздзяленні. Пасля грамадз. вайны на камандных пасадах у Чырв. Арміі. Аўтар прац па гісторыі рэвалюц. руху ў Сярэдняй Азіі.

Літ.: За Советский Туркестан. Сб. воспоминаний, Ташкент, 1963.
М. І. Іоська. Мінск.

ГУШЧА (Huszcza) Ян (н. 24.12.1917, фальварак Загасцінне Дзісенскага пав. Віленскай губ.), польскі пісьменнік. Скончыў гімназію ў Дзісне (1934), вучыўся ў Віленскім ун-це (1934—39). У 30-я г. супрацоўнік віленскіх прагрэс. газ. «Poprostu» («Папросту»), «Karta» («Карта»). З 1945 жыве ў Лодзі. Першы зб. вершаў «Балада пра падарожных» (1938, Вільня). Выдаў каля 30 кніг вершаў («Між крыку чаек», 1959; «Новая ніска вершаў», 1963; «Стары скляпок мінводаў», 1968) і прозы («Мястэчка над Альшанкай», 1948; «З далёкіх дарог», 1957; «Кругі», 1964). Перакладчык і папулярызатар бел. л-ры. Склаў анталогію «Беларускія вершы» (1971, Лодзь). Пераклаў на польскую мову творы многіх бел. паэтаў.

Тв.: Бел. пер.— у час.: «Полымя», 1970, № 7; «Маладосць», 1970, № 6; «Вожык», 1970, № 17; Odzyskiwanie przeszłości, Łódź, 1967; Sęp Sybiru, Łódź, 1968; Pan Gracjan i inni, Łódź, 1970.

Літ.: Fornalczyk F. Z rodu poetów, Łódź, 1969.
А. А. Лойка. Мінск.

ГУШЧЫН Павел Фёдаравіч (14.10.1924, в. Антушава Гара Тоцемскага пав. Валагодскай губ.— 15.2.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1942. Вызначыўся ў чэрв. 1944 каля Шклова Магілёўскай вобл. Рота пад камандаваннем Г. фарсіравала Дняпро, захапіла плацдарм.

ГУШЧЫН Фёдар Лаўрынавіч (н. 17.1.1925, в. Стара-Студзёнаўка Сярдобскага пав. Пензенскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1943. Вызначыўся ў Палескай вобл. 1—2.10.1943 аддзяленне на чале з сяржантам Г. фарсіравала Дняпро каля Брагіна, выбіла ворага з перадавых траншэй, адбіла некалькі варожых контратак. Жыве ў Дзяржынску Горкаўскай вобл.

ГУШЧЫЦЫ, вёска ў Скідальскім с/с Гродзенскага р-на, у сутоку рэк Пыранкі і Котры. Цэнтр калгаса «Котра». За 26 *км* на ПдУ ад Гродна, 4 *км* ад чыг. ст. Скідаль, каля шашы Гродна — Шчучын (2 *км*). 274 ж., гасп. 90 (1971). Міжраённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 43 сав. воінам Айч. вайны.

ГУЯН (Гуйчжу, Гуйчжоў), горад на ПдЗ Кітая. Адм. ц. правінцыі *Гуйчжоў*. 504 тыс. ж. (1957). Вузел чыгунак і шматэйных дарог. Металург. прамысловасць. З-д горнаруднага абсталявання, прадпрыемствы хім., цэментнай, шкляной, папяровай, шоўкамаатальнай прамысл. Паблізу здабыча жал. руды, апатытаў, вугалю. Філіял АН Кітая, ін-ты нац. меншасцей, с.-г., медыцынскі і педагагічны.

ГХОШ Аджой Кумар (20.2.1909, мяст. Міхіджам каля г. Каншур — 13.1.1962), дзеяч індыйскага і міжнар. рабочага руху. З сям'і ўрача. Рана ўключыўся ў нац.-вызв. рух, быў актыўным прафс. дзеячам. З 1931 чл. кампартыі Індыі (КПІ). З 1933 чл. ЦК (з 1958 Нац. савета), з 1936 чл. Палітбюро (з 1958 Цэнтр. выканаўчага к-та) КПІ. У 1951 выбраны ген. сакратаром ЦК партыі. За рэвалюц. дзейнасць арыштоўваўся і знявольваўся (прасядзеў у турмах больш за 6 гадоў). Узначальваў дэлегацыі КПІ на Маскоўскіх нарадах



прадстаўнікоў камуніст. і рабочых партый 1957 і 1960, на XX—XXII з'ездах КПСС.

Тв.: Рус. пер.— Статьи и речи, М., 1962.

Літ.: Полонская Л. Р. и Шаститко П. М. Аджой Гхош, «Вопросы истории», 1969, № 6.

ГЭБЕЛЬ, інструмент для ручнога стругання драўніны; разнавіднасць струга. Гл. *Сталярны інструмент.*

ГЮГО (Hugo) Віктор Мары (26.2.1802, Безансон — 22.5.1885), французскі пісьменнік. Сын напалеонаўскага генерала. Першы зб. «Оды і розныя вершы» (1822), напісаны з пазіцый рэакц. рамантызму, услаўляў манархію і каталіцызм. Прадмова да гістар. драмы «Кромвель» (1827) — маніфест прагрэс. рамантызму ў франц. л-ры, прынцыпы якога ўвасоблены ў драмах «Эрнані» (паст. 1830), «Марыён Дэлорм» (1829), «Кароль забаўляецца» (1832), «Руі Блаз» (1838) і сац. аповесцях «Апошні дзень асуджанага на смерць» (1829), «Клод Гё» (1834). Зборнік вершаў «Усходнія матывы» (1829) — пра гераяў нац.-вызв. барацьбы ў Грэцыі. Горача вітаў Ліпеньскую рэв. 1830 (паэма «Да маладой Францыі»). У гістар. рамане з жыцця Францыі 15 ст. «Сабор Парыжскай божай мацеры» (1831) раскрыў сапраўдную чалавечнасць і душэўнае харства людзей з народа (Эсмеральда, Квазімода), проціпаставіў іх прадстаўнікам арыстакратыі і духавенства. Пасля дзярж. пераварота 1851 эміграваў. У 50—60-я г. шырока разгарнулася грамадская дзейнасць Г. (выступаў у абарону італьян. рэвалюцыянера Дж. Гарыбальдзі, змагара за вызваленне амер. неграў Дж. Браўна, рус. рэвалюцыянераў; падтрымліваў нац.-вызв. рух у Польшчы, на Кубе і Крыце). Заклеймаваў ганьбаю рэакц. паліт. рэжым Напалеона III у памфлетах «Маленькі Напалеон» (1852) і «Гісторыя аднаго злачынства» (1877), у зб. вершаў «Адплата» (1853). У рамане «Адверженыя» (1862) выкрыў сац. несправядлівасць бурж. грамадства, даў карціны нар. паўстання, стварыў вобраз хлопчыка Гаўроша, які па-геройску загінуў на барыкадах. Прац. подзвіг простага чалавека апаэтызаваў у рамане «Працаўнікі мора» (1866). Раман «Чатырыляе англ. гісторыі 17—18 ст.,— бязлітасны прысуд бурж.-арыстакр. грамадству. У зб. вершаў «Грозны год» (1872) паказаны падзеі Парыжскай камуны, сапраўднага гістар. зместу якой Г. не зразумеў, але асуджаў белы тэрор версальцаў і апяваў мужнасць камунараў. У рамане «Дзевяноста трэці год» (1874), пра франц. бурж. рэв. канца 18 ст., сцвярджаў вечалавека. На бел. мову вершы Г. перакладалі Э. Агняцвет, Ю. Гаўрук, С. Ліхадзіеўскі.



Тв.: Бел. пер.— Дзевяноста трэці, Мн., 1937; Адверженыя, Мн., 1938; рус. пер.— Собр. соч., т. 1—15, М., 1953—56.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967 (гл. т. 2, Пакавальнік імён); Николаев В., В. Гюго. Критико-биогр. очерк, 2 изд., М., 1955; Муравьева Н. Гюго, М., 1961; Трескунов М. С. Виктор Гюго. Очерк творчества, 2 изд., М., 1961; Морщинер М. С. и Пожарский Н. И. (сост.). Библиография русских переводов произведений В. Гюго, М., 1953; Бонт Ф. Рыцарь мира, пер. с франц., М., 1953.

В. П. Міцкевіч. Мінск.

ГЮЙГЕНС (Huygens) Хрысціян (14.4.1629, Гаага — 8.6.1695), нідэрландскі механік, фізік і матэматык. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (з 1663) і Парыжскай АН (з 1666). У 1665—81 працаваў у Парыжы. Залажыў асновы хвалевай тэорыі святла, даў першапач. фармулёўку *Гюйгенса — Фрэнеля прынцыпа*. Аўтар прац пра рух цела пад дзеяннем удару, пра цэнтрабежную сілу. Вынайшаў маятнікавы гадзіннік (1657) і даследаваў шэраг праблем, звязаных з рухам маятніка. Удасканальваў падзорныя трубы, з дапамогай іх адкрыў спадарожнік Сатурна (Тытан), кольца Сатурна. Сканструяваў *акуляр* (акуляр Г.). Вызначыў (з Р. *Гукам*) пастаянныя пункты тэрмометра — пункт раставання лёду і пункт кіпення вады.

Тв.: Рус. пер.— Трактат о свете..., М.— Л., 1935; Три мемуара по механике, [Л.], 1951.

Літ.: Франкфурт У. И. и Френк А. М. Христиан Гюйгенс. 1629—1695, М., 1962 (бібліягр.).

ГЮЙГЕНСА — ФРЭНЕЛЯ ПРЫНЦЫП, сцвярджэнне, што пункты прасторы, да якіх дайшло хвалевае ўзбурэнне, з'яўляюцца другаснымі (фіктыўнымі) крыніцамі выпрамянення кагерэнтных хваляў. Хвалі інтэрферыруюць паміж сабой, і пабудаваная для некат. моманту часу іх агінальная паказвае становішча хвалевага фронту ў гэты момант (гл. рыс.). Сфармуляваны ў 1690 Х. *Гюйгенсам*, развіты з улікам інтэрферэнцыі ў 1818 франц. вучоным А. Ж. Фрэнелем (1788—1827), строгую матэм. фармулёўку даў у 1882 Г. Р. *Кірхгоф*.



Г.— Ф. п. выкарыстоўваецца пры рашэнні дыфракцыйных задач. Гл. таксама *Дыфракцыя хваляў, Інтэрферэнцыя.*

ГЮНЦКАЕ АБЛЕДЗЯНЕННЕ, гл. *Варажскае абледзяненне.*

ГЮНЦ-МІНДЭЛЬСКАЕ МІЖЛЕДАВІКОЎЕ, гл. *Белавежскае міжледавікоўе.*

ГЮРЗА (Vipera lebetina), ядавітая змяя сям. *гадзюк*. Пашырана ў Паўн. Афрыцы і зах. частцы Азіі. У СССР — у Закаўказзі і Сярэдняй Азіі.

Цела тоўстае, шэрага колеру з цёмна-бурымі плямамі, даўж. да 1,5 м. Галава ўкрыта рабрыстай лускою. Жыве Г. ў бязводным стэпе, гарах, далінах рэк. Корміцца грызунамі, яшчаркамі, птушкамі. Зімуе ў норах. Яйцажывородная. Яд Г. мае гуманальнае дзеянне. Укус не часта смяртэльны для чалавека. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Змеі*.

Д

Д, пятая літара беларускага і некат. іншых славянскіх алфавітаў. Бярэ пачатак з кірыліцкай Д («дабро»), што ўзнікла на базе візант. «дэльты» (Δ). У старабел. пісьменнасці мела некалькі варыянтаў, якія памагаюць вызначыць, дзе і калі быў напісаны помнік. У сучаснай бел. мове абазначае выбухны звонкі непалаталізаваны гук «д» («вуда», «дуб»), а перад глухімі зычнымі і на канцы слоў — «т» («кладка», «сад»).

«ДА ПРАЦЫ», газета рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку ў Заходняй Беларусі, якая выдавалася з 1.10.1927 да 16.12.1928 у Вільні на бел. мове. Працягвала традыцыі газет *Беларускай сялянска-рабочай грамады*. З 12.3.1928 орган Беларускага сялянска-рабочага пасольскага клуба *«Змаганне»*.

Назва газеты мянялася: «Наша праца» (з 1 да 29.10.1927), «Праца» (з 5 да 23.11.1927), «Права працы» (з 7 да 24.12.1927), «Навагодняя праца» (27.12.1927; аднадзёнка), «Думка працы» (з 4 да 28.1.1928), «Сіла працы» (з 1 да 24.2.1928), «Воля працы» (з 12 да 31.3.1928), «Голас працы» (з 14 крас. да 30.5.1928), «Зара працы» (з 2 да 29.6.1928), «Сцяг працы» (з 4 да 31.7.1928), «Доля працы» (з 3 да 29.8.1928), «Рэха працы» (з 1 да 29.9.1928), «Слова працы» (з 5 да 31.10.1928), «За працу» (з 5 да 27.11.1928). Пад назваю «Да працы» выходзіла з 1 да 16.12.1928.

Пісала пра нац.-вызваленчы і забастовачны рух працоўных Зах. Беларусі, пра іх цяжкае становішча. Значную ўвагу аддавала падрыхтоўцы да выбараў у 1928 у польскі сейм: крытыкавала палітыку польскіх улад, польскіх бурж. партый, бел. нацыяналіст. груповак, заклікала галасаваць за спісы рабочых і сялян. Змяшчала матэрыялы пра поспехі сацыяліст. буд-ва ў БССР, пра міжнар. рабочы рух. Канфіскавана больш за 50 нумароў газеты. Закрыта польскімі ўладамі.

С. В. Говін. Мінск.

ДААСІЗМ, вучэнне пра «дао» («шлях») рэчаў, якое ўзнікла ў Кітаі ў 6—5 ст. да н. э. Заснавальнікам Д. лічаць Лао-цзы. Ідэі вучэння выкладзены ў кнізе Лао-цзы «Дао-дэ-цзін» у 4—3 ст. да н. э.

Асн. паняцце Д.— «дао» тлумачылася супярэчліва: як натуральны ход рэчаў, заканамернасць матэрыяльнага свету, першапрычына ўсяго існага або як боскі шлях стварэння і існавання свету. Прыхільнікі Д. ідэалізавалі традыцыі старажытнасці і прапаведавалі вяртанне да першабытнай абшчыны. У 1—3 ст. н. э. Д. склаўся як адна з кіт. рэлігій. Яе ідэйная аснова — ідэаліст. і містычнае тлумачэнне паняцця «дао» і *будызм*. Спачатку даоскае веравучэнне адлюстроўвала пратэст нізоў супраць сац. несправядлівасці, пасля яно было істотна зменена і прыстасавана да інтарэсаў пануючых класаў. Д. прапаведаваў пакорлівасць, непраціўленне злу, карыстаўся замовамі, варажбою, раіў розныя сродкі фіз. і духоўнага самаўдасканалення.

ДАБАСНА (Добасна), рака, правы прыток Дняпра. Даўж. 81 *км*. Цячэ ў Кіраўскім, Рагачоўскім і Жлобінскім р-нах Магілёўскай і Гомельскай абл. Вадазбор (874 *км²*) — хвалістая раўніна, плоскія паніжэнні якой забалочаны. Шыр. даліны 0,7—0,9 *км*, схілы спадзістыя. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 3,9 *м³/сек*. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік пры асушэнні балотаў.

ДАБЕЕЎСКАЕ, возера, вытак р. Сечны, правага прытока Зах. Дзвіны, у Шумілінскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,6 *км²*. Даўж. 2,3 *км*, найб. шыр. 1,6 *км*, сярэдняя 1,1 *км*. Вадазбор (84,9 *км²*) нізінны. Злучана пратокамі з азёрамі Круглік і Мошна. Водзяцца акунь, шчупак, язь, плотка, лешч, верхаводка, карась.

ДАБЕЯ, вёска ў Шумілінскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 8 *км* на ПдЗ ад Шуміліна, 46 *км* ад Віцебска. 152 ж., гасп. 49 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкіх магілах 56 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДАБРАБЫТ, задавальненне матэрыяльных і духоўных патрэб чалавека ці асобнай сям'і. Вызначаецца: па рэальных даходах насельніцтва; ступені задавальнення яго патрэб неабходнымі для жыцця матэрыяльнымі дабротамі (аб'ём і якасць харчавання, адзенне, абутак, жыллёва-бытавыя ўмовы, мэбля, хатні інвентар); па працягласці *вольнага часу*; развіцці грамадскіх паслуг; арганізацыі адпачынку, аховы здароўя, асветы; магчымасці людзей выяўляць свае здольнасці і таленты. Гэтыя бакі жыцця характарызуюцца адпаведнымі паказчыкамі, велічыня якіх залежыць ад

узроўню развіцця прадукцыйных сіл і характару вытв. адносін у краіне. Сацыяліст. грамадства ставіць мэту максімальна задаволіць пастаянны рост матэрыяльных і духоўных патрэб народа. Гэта найвышэйшая мэта грамадскай вытворчасці пры сацыялізме. Істотнае павышэнне Д. сав. народа вызначана XXIV з'ездам КПСС як гал. задача 9-й пяцігодкі.

У СССР ажыццяўляецца планамернае павышэнне *заработнай платы* рабочых і служачых, *аплаты працы* калгаснікаў. Насельніцтва дадаткова атрымлівае шмат выплат і льгот з *грамадскіх фондаў спажывання* ў выглядзе пенсій, дапамог, стыпендый, бясплатнай адукацыі, мед. абслугоўвання і інш. паслуг за кошт дзяржавы. З ростам *рэальных даходаў насельніцтва* расце плацежаздольны попыт. Каб яго задаволіць, павялічваецца выпуск і пашыраецца асартымент прадукцыі, павышаецца яе якасць, развіваецца *грамадскае харчаванне, гандаль*. У вышэйшую расце і *спажыванне*. Хуткімі тэмпамі ажыццяўляецца жыллёвае буд-ва: па яго тэмпах БССР апярэджвае ЗША, Вялікабрытанію, Італію, Францыю. Жыллё з усімі камунальнымі выгодамі атрымліваюць не толькі жыхары гарадоў, а і вёсак (гл. *Будаўніцтва, Жыллёвая гаспадарка*). Развіваецца *бытавое абслугоўванне насельніцтва, ахова здароўя, асвета*, ствараюцца ўмовы для *адпачынку* і павышэння культурнага ўзроўню працоўных. У БССР, як і ў цэлым па СССР, вызначаны значна меншы пенсійны ўзрост, чым у ЗША, ФРГ, Швецыі і інш. капіталіст. краінах (гл. *Сацыяльнае забеспячэнне*). Павышэнне дабрабыту працоўных спрыяльна адбіваецца на працягласці іх жыцця. У 1969 у БССР у параўнанні з 1913 смяротнасць знізілася амаль у 4 разы. Сярэдняя працягласць жыцця беларусаў 73 гады, адна з самых высокіх у свеце.

У развітых капіталіст. краінах за сярэднімі лічбамі ўзроўню жыцця завуаліравана грабежніцкая, эксплуататарская сутнасць капіталізму. Бурж. тэорыі пра класавы мір, *згармонію інтарэсаў* у гэтых краінах, пра «вялікае грамадства» і «ўсеагульны дабрабыт» абвяргаюцца фактамі. Манаполіі імперыяліст. дзяржаў абагачаюцца за кошт ограбления іншых краін. Яны ўзмацняюць таксама эксплуатацыю працоўных сваіх краін, што паглыбляе падзел грамадства на 2 полюсы — багацця і беднасці. Слрод насельніцтва расце *беспрацоўе*, абвастраецца *жыллёвае пытанне*, павышаюцца цэны, вялікая колькасць людзей, асабліва ў краінах — былых калоніях імперыялліст. дзяржаў, пакутуе ад хранічнага галадання.

Літ.: Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961, с. 92—102; Матэрыялы XXIV з'езду КПСС, Мн., 1971; Рост материального благосостояния и культуры белорусского народа, Мн., 1969; Реальные доходы и жизненный уровень трудящихся, Мн., 1966; Экономика Советской Белоруссии, 1917—1967, Мн., 1967; Белорусская ССР за годы Советской власти, Мн., 1967; Доходы и покупательский спрос населения, М., 1968; Саркисян Г. С. и Кузнецова Н. П. Потребности и доход семьи, М., 1967; Страна Советов за 50 лет, М., 1967; Экономика стран социализма, М., 1969; Маклярский Б. И. «Великое общество»: декларации и действительность, М., 1969; Богословский В. В. Полюс нищеты в «государстве всеобщего благоденствия», М., 1969 (бібліягр.).

В. І. Дрыч. Мінск.


ДАБРАВОЛЬСКІ Георгій Цімафеевіч (1.6.1928, Адэса — 30.6.1971), лётчык-касманаўт СССР. Герой Сав. Саюза (1971), падпалкоўнік. Чл. КПСС з 1954. Скончыў Адэскую спецшколу ВПС (1946), Чугуеўскае ваен.-авіяц. вуч. лётчыкаў (1950), без адрыву ад лётнай работы Ваен.-паветр. акадэмію (1961). У 1950—63 лётчык-знішчальнік у часцях ВПС. З 1963 у атрадзе касманаўтаў. Камандзір касм. карабля «Саюз-11» (борт-інжынер У. М. *Волкаў* і інжынер-выпрабавальнік В. І. *Пацаеў*), 6.6.1971 выведзенага на арбіту вакол Зямлі, 7 чэрв. састыкаванага з арбітальнай касм. станцыяй *«Салют»*. Экіпаж карабля перайшоў на першую ў свеце пілотную касм. станцыю. Пасля выканання праграмы палёту 29 чэрв. касманаўты вярнуліся на транспартны карабель «Саюз-11». Адбылася расстыкоўка з станцыяй, і 30.6.71 карабель прызямліўся непадалёку ад Караганды. Пры вяртанні на Зямлю экіпаж карабля ў складзе Героя Сав. Саюза Д., двойчы Герой Сав. Саюза У. М. Волкава і Героя Сав. Саюза В. І. Пацаева загінуў. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.



ДАБРАВОЛЬСКІ Ерафей Уладзіміравіч [н. 6(19).11.1903, в. Шалаеўка Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.], генерал-лейтэнант (1945), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1927. У Чырв. Арміі з 1925. У Айч. вайну камандзір палка, дывізіі, корпуса. Удзельнік баёў пад Масквой, на Беларусі. Войскі корпуса вызначыліся ў баях на Віслe каля г. Казімеж. Прарвалі варожую абарону, знішчылі і захапілі 649 варожых гармат, 123 танкі, 4011 аўтамашын, 200 матацыклаў. З 1945 нач. управлення аховы ваен. камендатуры ў Дрэздэне, з 1955 нам. камандуючага паветр.-дэсантных войск, з 1956 у ваен. акрузе. З 1958 у запасе. Жыве ў Маскве.



ДАБРАВОЛЬСКІ Уладзімір Мікалаевіч [30.7(11.8).1856, с. Красна-Свяцкае Смаленскага пав.— 8.5.1920], беларускі і рускі этнограф, фальклярыст, краязнавец, лексікограф. Скончыў Маскоўскі ун-т (1880). Пасля Кастр. рэв. выкладаў гісторыю рус. тэатра і этнаграфіі ў Бел. нар. ун-це (Масква), Віцебскім ін-це нар. асветы, у Смаленскім адда. Маскоўскага археал. ін-та. Запісваў рус. і бел. фальклор, збіраў нар. песні, казкі, легенды, паданні, прыказкі Смаленшчыны. Друкаваўся ў час. «Живая старина», «Этнографическое обозрение». Аўтар арт. «Прыказка і загадка» (1898), «Пра некаторыя архаічныя звычаі, што перажывае парод у Смаленскай губерні» (1900), «Кросны» (1902), «Адрозненні ў вераваннях і звычаях беларусаў і вялікарусаў Смаленскай губерні» (1903), «Нячыстая сіла ў народных вераваннях» (1908).



Тв.: Смоленский этнографический сборник, ч. 1—4, СПб.— М., 1891—1903; Смоленский областной словарь, Смоленск, 1914.

Літ.: Дмитриев В. В., В. Н. Добровольский (Краткий биогр. очерк), Смоленск, 1930; Шлюбскі А. Этнаграфічная дзейнасць Дабравольскага, Мн., 1928; Сидельников В. Смоленский этнограф и краевед В. Н. Добровольский, «Смоленский альманах», 1951, кн. 9; Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст., Мн., 1964.

І. У. Саламевіч. Мінск.

ДАБРАВО́ЛЬСКІ Фядос Філімонавіч (н. 26.11(9.12).1909, в. Падрэчча Слуцкага пав. Мінскай губ.), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Рагачоўскае пед. вучылішча (1930), Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1950). Да 1941 настаўнік, дырэктар сярэдняй школы, заг. Тураўскага райана. У партызанах з ліп. 1941: палітрук узвода, роты; з жн. 1943 камісар *партызанскага палка 537-га* Магілёўскай вобл. У 1944—56 на парт. рабоце ў Кіраўскім і Расонскім РК КПБ. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі. Жыве ў г. п. Расоны Віцебскай вобл.

ДАБРАВО́ЛЯ, вёска ў Свіслацкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 18 *км* на ПдЗ ад г. п. Свіслач, 114 *км* ад Гродна, 16 *км* ад чыг. ст. Свіслач. 1232 ж., гасп. 426 (1971). Павільён быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адда. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, партызанаў і мірных жыхароў Д., якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАБРАГО́ШЧА, вёска ў Жлобінскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Мормаль». За 34 *км* на ПдЗ ад Жлобіна, 117 *км* ад Гомеля, 6 *км* ад чыг. ст. Яшчыцы. 959 ж., двароў 283 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі і сад, адда. сувязі, сталовая, 2 магазіны, швейная майстэрня. Вёску двойчы (1941, 1942) спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 430 сав. воінаў, мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 217 землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАБРАЛЮБАЎ Мікалай Аляксандравіч [24.1(5.2).1836, Ніжні Ноўгарад — 17(29).11.1861], рускі рэвалюц. дэмакрат, філосаф-матэрыяліст, літаратурны крытык і публіцыст. З сям'і свяшчэнніка. Вучыўся ў Ніжагародскім духоўным вучылішчы і семінарыі (1848—53), у 1857 скончыў Пецярбургскі гал. пед. ін-т. У 1856 М. Чарнышэўскі запрасіў яго супрацоўнічаць у час. «Современник» (першы надрукаваны арт. «Субяседнік аматараў расійскага слова»). З 1857 вёў аддзел крытыкі і бібліяграфіі, а потым і сатыр. дадатак «Свисток». У «Современнике» апублікаваў некалькі соцень артыкулаў па пытаннях навукі і л-ры. Галоўныя: «Арганічнае развіццё чалавека ў сувязі з яго разумовай і маральнай дзейнасцю» (1858), «Пра значэнне аўтарытэту ў выхаванні» (1857), «Руская цывілізацыя, прыдуманая п. Жарабцовым» (1858), «Роберт Овен і яго спробы грамадскіх рэформаў» (1859), «Што такое абломаўшчына?» (1859), «Цёмнае царства» (1859), «Калі ж прыйдзе сапраўдны дзень?» (1860), «Прамень святла ў цёмным царстве» (1860). Д.— ідэйны патхняцель рэвалюц. руху ў Расіі ў 50-я г. 19 ст., адзін з папярэднікаў рус. сацыял-дэмакратыі. Усё жыццё аддаў барацьбе супраць самадзяржаўна-прыгонніцкага ладу. Змагаўся з лібералізмам, у якім бачыў абаронцу інтарэсаў буржуазіі. Выступаў за сялянскую рэвалюцыю; яна, на яго думку, адкрые шлях да сацыялізма ў Расіі. Але сацыяліст. ідэалы Д. былі утапічныя, ён не разумеў, што пралетарыят — адзіная паліт. сіла, здольная ажыццявіць сацыяліст. рэвалюцыю. Нягледзячы на ідэаліст. разуменне гісторыі, у грамадска-паліт. поглядах, цесна звязаных з яго рэвалюц. дэмакратызмам, Д. выказаў нямала матэрыяліст. здагадак, якія набліжаюць яго да гістар. матэрыялізму: пра грамадскую заканамернасць, класавую барацьбу працоўных з эксплуататарамі, ролю нар. мас і асобы ў гісторыі. Разам з Чарнышэўскім паслядоўна развіваў філас. матэрыялізм і ваяўнічы атэізм, крытыкаваў ідэаліст., агнастычныя і вульгарна-матэрыяліст. вучэнні. Разглядаў свет як вечны працэс развіцця, крыніца якога — барацьба процілегласцей. Развіваючы ідэі В. Р. Бялінскага, Д. распрацоўваў асновы матэрыяліст. эстэтыкі. Адстойваў прынцыпы рэалізму, народнасці, высокай ідэйнасці л-ры, сувязь яе з надзённымі сацыяльна-паліт. пытаннямі рэвалюц. барацьбы, крытыкаваў тэорыю «чыстага мастацтва». У працах па пытаннях педагогікі выступаў супраць казёншчыны ў навучанні і патрабаваў выхоўваць маладое пакаленне ў духу патрыятызму, самаадданага служэння грамадству, народу. З павагаю ставіўся да бел. народа, яго самабытнай культуры, крытыкаваў пашыраныя ў той час антынавук. адносіны да беларусаў. У арт. «Рысы для характарыстыкі рускага простанароддзя» (1860) пісаў: «...Пытанне пра характарыстыку беларусаў павінна хутка быць растлумачана працамі мясцовых пісьменнікаў. Паглядзім, што яшчэ скажуць самі беларусы» (Избранные философские сочинения, т. 2, М., 1946, с. 261).



Тв.: Собр. соч., т. 1—9, М., 1961—64.

Літ.: Ленін У. І. Пачатак дэманстрацый, Тв., т. 5, с. 296 (Полн. собр. соч., т. 5, с. 370); Кружков В. С. Мировоззрение Н. А. Добролюбова, М., 1952; Бурлацкий Ф. М. Политические взгляды Н. А. Добролюбова, М., 1954; Караганов А. Чернышевский и Добролюбов о реализме, М., 1955; Наумова М. А. Социологические, философские и эстетические взгляды Н. А. Добролюбова, М., 1960; Жданов В. В., Н. А. Добролюбов. Критико-биографический очерк, М., 1961.

В. І. Суяпанаў. Мінск.

ДАБРАМЫ́СЛІ, вёска ў Лёзненскім р-не Віцебскай вобл., на левым беразе р. Чарніцы. Цэнтр сельсавета. За 15 *км* на ПдЗ ад Лёзна, 47 *км* ад Віцебска. 425 ж., гасп. 146 (1971). ГЭС, лясніцтва, швейная майстэрня, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, вет. пункт, адда.

сувязі, сталовая, 3 магазіны. На дзвюх брацкіх магілах помнікі 260 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАБРАПОЛЛЕ, вёска ў Пачапаўскім с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Маяк». За 25 *км* на ПнЗ ад Баранавіч, 231 *км* ад Брэста, 3 *км* ад чыг. ст. Міцкавічы. 154 ж., гасп. 40 (1971). За 1 *км* ад Д. торфапрадпрыемства «Каўпеніца». Б-ка, урачэбны пункт, сталовая, магазін.

ДАБРАСЕЛЬЦЫ, вёска ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Сасва. Цэнтр сельсавета. За 24 *км* на Пд ад Зэльвы, 140 *км* ад Гродна, 26 *км* ад чыг. ст. Зэльва; аўтобусныя зносіны з Зэльвай. 288 ж., гасп. 88 (1971). Швейная майстэрня. Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ДАБРАЎЛЯНЫ, вёска ў Сыраваткінскім с/с Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр саўгаса «Дабраўляны». За 45 *км* на Пн ад Смаргоні, 205 *км* ад Гродна. 211 ж., гасп. 62 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. Помнік 8 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДАБРО І ЗЛО, асноўныя катэгорыі этыкі, якія ўжываюцца пры маральнай ацэнцы пасобных з'яў грамадскага і паліт. жыцця, учынкаў і матываў дзейнасці людзей. Дабро атаясамліваецца з такімі ўчынкамі, якія адпавядаюць ідэалам і нормам паводзін паасобных людзей, класаў і грамадства цалкам на пэўным этапе гістар. развіцця, зло разглядаецца як учынкі, якія не адпавядаюць гэтым ідэалам і нормам. Д. і з.— паняцці класавыя і гістарычныя, таму на працягу гісторыі існавалі шматлікія і супярэчлівыя тэорыі гэтых паняццяў.

У дуалістычных рэлігіях Ст. Усходу ўвесь Сусвет разглядаўся як барацьба дзвюх асноў — дабрай і злой. Паводле будызму зло карэніцца ў самім існаванні чалавека. На думку Сакрата, чалавек робіць зло выпадкова, не ведаючы, блытаючы яго з дабром. Хрысц. рэлігія сцвярджае, што ідэя найвышэйшага дабра ўвасоблена ў богу, а зло паходзіць ад чалавека, які злоўжывае свабодай волі. Матэрыялісты 18 ст. (Вальтэр, К. Гельвецый, Д. Дзідро) абвясцілі інтарэсы чалавечай асобы крытэрыем адрознення Д. і з.

Марксісцкае вучэнне пра заканамернасці грамадскага развіцця стварыла аснову для навук. ўяўлення пра Д. і з. Іх аб'ектыўны крытэрый — інтарэсы нар. мас, прагрэс. развіццё грамадства. У эксплуататарскім грамадстве супярэчнасці Д. і з.— гэта адлюстраванне ў сферы маралі асн. сац. супярэчнасцей. У сацыяліст. грамадстве складваюцца адзіныя агульнанар. ўяўленні пра Д. і з. Яны выяўляюцца праз сукупнасць канкрэтных маральных патрабаванняў, што вызначаюць нормы такіх паводзін людзей, якія актыўна садзейнічаюць паспяховаму будаўніцтву камунізма.

Літ.: Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Задачы Саюзаў моладзі, Тв., т. 31 (Полн. собр. соч., т. 41); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Согомонов Ю. В. Добро и зло, М., 1965; Основы марксистско-ленинской этики, Мн., 1965; Шишкин А. Основы коммунистической морали, М., 1965; Ленсу М. Я. Добро и зло, Мн., 1965.

У. М. Конан. Мінск.

ДАБРОМЫСЛЬ, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на правым беразе р. Шчары. Цэнтр сельсавета і калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 38 *км* на ПнУ ад Іванцэвіч, 174 *км* ад Брэста, 28 *км* ад чыг. ст. Даманава. 1028 ж., гасп. 319 (1971). Лясніцтва, майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, амбулаторыя, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны.

ДАБРОТНАСЦЬ (у электра- і радыётэхніцы), 1) велічыня, якая характарызуе рэзанансавыя ўласцівасці вагальнай сістэмы (контура). Роўная адносінам амплітуды напружання на кандэнсатары контура пры рэзанансе да амплітуды знешняй электрарухальнай сілы. Чым вышэйшая Д. контура, тым навольней у ім затухаюць ваганні, тым вастрэйшая яго рэзанансавая крывая.

Д. мае велічыню парадку 10^2 у радыёвымяральных прыёмніках, да 10^4 у радыётэхн. прыладах дэцыметровага і сантыметровага дыяпазонаў. П'езакварцавыя пласцінкі, якія ўжываюцца ў радыётэхніцы як рэзанатары, маюць вельмі малое ўласнае затуханне, іх Д. парадку 10^5—10^6.

2) Д. сістэмы аўтаматычнага рэгулявання — велічыня, якая характарызуе дакладнасць работы сістэмы ў сталым рэжыме. 3) Д. вымяральных прылад — характарыстыка прылад з непасрэдным адлікам велічынь на шкале, у якіх рухомая частка вымяральнага механізма круціцца на апорах з трэннем. Каэфіцыент Д. роўны адваротнай велічыні адноснай хібнасці прылады ад трэння. 4) Д. пругкіх сістэм — характарыстыка, якая паказвае, у колькі разоў амплітуда вымушаных ваганняў сістэмы на рэзанансавай частаце перавышае амплітуду вымушаных ваганняў той жа сістэмы на далёкіх ад рэзанансу частотах, пры аднолькавай велічыні прымусовай сілы.

ДАБРЫЛАЎКА, рака, правы прыток Бярозаўкі (бас. Зах. Дзвіны). Даўж. 30 *км*. Цячэ па тэр. Дзісенскай нізіны ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. вадазбору 133 $км^2$. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,86 $м^3/сек$. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ДАБРЫНЕВА, вёска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 20 *км* на ПдУ ад Дзяржынска, 58 *км* ад Мінска, 18 *км* ад чыг. ст. Койданава. 504 ж., гасп. 183 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У рэвалюцыю 1905—07 сяляне Д. выступалі супраць тагачасных парадкаў. Помнік 103 сав. грамадзянам і помнік на брацкай магіле 12 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАБРЫНІН Барыс Фёдаравіч [14(26).5.1885, Мінск — 4.9.1951], савецкі географ. Д-р геагр. н. (1935). У 1908—11 зрабіў паездкі па Італіі, Францыі, Іспаніі, Швейцарыі, у 1925 па Мексіцы, напісаў шэраг краіназнаўчых нарысаў. З 1931 праф. Маскоўскага ун-та. Вёў палявыя даследаванні ў Крыме, на Каўказе, у цэнтр. частцы Рускай раўніны і Сярэднім Паволжы. Асн. працы: «Фізічная геаграфія СССР. Еўрапейская частка і Каўказ» (1941, 2 выд., 1948); «Фізічная геаграфія Заходняй Еўропы» (1948); «Зарубежная Азія» (1956, саўтар).

ДАБРЫНІН Міхаіл Кузьміч (23.1.1889, Рослаўль Смаленскай губ.— 8.7.1955), рускі і беларускі савецкі літаратуразнавец. Д-р філал. н. (1951), праф. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Смаленскі ун-т (1924). Выкладаў у ВНУ Масквы і Мінска. У 1946 сакратар праўлення СП СССР. Працаваў заг. сектара літаратур народаў СССР Ін-та сусв. л-ры, заг. кафедры л-ры Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва імя Луначарскага (1937—55). Даследчык л-ры народаў СССР.

Тв.: Против механистов и эклектиков, М., 1931; Беларуская літаратура. Старажытны перыяд, Мн., 1952.

ДАБРЫНЬ, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Беларусь». За 17 *км* на ПдУ ад Дуброўна, 124 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Зубры, на шашы Дуброўна — в. Сава. 245 ж., гасп. 76 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 58 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАБРЫЦА, рака, правы прыток Друці (бас. Дняпра). Даўж. 35 *км*. Цячэ ў Кіраўскім і Рагачоўскім р-нах Магілёўскай і Гомельскай абл. Вадазбор (250 $км^2$) — плоская, слаба перасечаная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,70 $м^3/сек$. Выкарыстоўваецца як водаприёмнік пры асушэнні балотаў.

ДАБРЫЦА, рака, правы прыток Усы (бас. Дняпра). Даўж. 25 *км*. Цячэ ў Чэрвеньскім і Бярэзінскім р-нах Мінскай вобл. Вадазбор (130 $км^2$) — плоская, складзеная марэннымі суглінкамі і супескамі раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,65 $м^3/сек$. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ДАБРЫЦА, рака, правы прыток Дняпра. Даўж. 24 *км*. Цячэ ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Вадазбор (149 $км^2$) — хвалістая раўніна, складзеная з водналедавіковых пяскоў і супескаў. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,74 $м^3/сек$. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ДАБРЫЦА, вёска ў Дабаснянскім с/с Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя М. Горкага. За 30 *км* на ПдУ ад Кіраўска, 120 *км* ад Магілёва, 55 *км* ад чыг. ст. Бабруйск. 86 ж., двароў 27 (1971). Мех. майстэрня, млын, клуб, б-ка. 29.9.1943 вёску спалілі нямфаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 26 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.



ДАБРЫЯН Іван Якаўлевіч [14(27).4.1913, в. Какошчыцы Слонімскага пав. Гродзенскай губ.— 22.1.1970], дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З сялян. Чл. КПСС з 1933. У 1930 уступіў у КСМЗБ, у 1933 у КПЗБ. Быў сакратаром падпольных Чамяроўскага раённага, Слонімскага і Навагрудскага акруговых к-таў КСМЗБ. Чл. ЦК КСМЗБ (1935). У ліст. 1935 арыштаваны і прыгавораны да 10 гадоў турмы. Актыўны ўдзельнік усталявання Сав. улады ў Зах. Беларусі. У гады Айч. вайны адзін з арганізатараў партыз. руху на Слонімшчыне, камісар атрада імя Дзяржынскага партыз. брыгады імя Ракасоўскага. Пасля вайны на сав. і гасп. рабоце ў Слоніме. Дэлегат II з'езду КПЗБ (1935); дэпутат Нар. сходу Зах. Беларусі (кастр. 1939). Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

ДАБУЖА, гарадзішча жалезнага веку, паселішча і курганны могільнік 2-й пал. 1-га тысячагоддзя і перыяду Кіеўскай Русі, за 6 *км* на Пд ад в. Дабужа Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. Гарадзішча памерам (*м*) 150×70 умацавана валамі і равамі. Даследавалі І. А. Сербаў (1926—27), Л. Д. Побаль (1965). Выяўлены сляды жытлаў, каменныя агнішчы, ляпная кераміка. Пры раскопках 18 курганоў знойдзены ляпныя слаба прафіляваныя пасудзіны, блізкія да знаходак навабыхаўскага, тошчыцкага і тайманаўскага бескурганных могільнікаў. Знаходкі даюць падставу меркаваць, што тут жылі *радзімічы*.

Л. Д. Побаль. Мінск.

ДАБУЖЫНСКІ Мсціслаў Валяр'янавіч [2(14).8.1875, Ніжні Ноўгарад — 20.11.1957], рускі жывапісец і графік. Уваходзіў у аб'яднанне «Свет мастацтва». Праф. (з 1922). З 1924 жыў за мяжой. Вучыўся ў Мюнхене (1899—1901) у А. Ажбе і Пецярбурзе (1901) у В. Матэ. Вядомы графічнымі партрэтамі, цыклам малюнкаў старых гарадоў (у т. л. Вільні, 1906—07, 1910, 1914; Віцебска, 1922—23), ілюстрацыямі («Белыя ночы» Ф. Дастаеўскага, 1923). Удзельнічаў у афармленні час. «Мир искусства» і інш., у 1905—06 супрацоўнічаў у сатыр. часопісах («Жупел» і інш.). З 1907 працаваў у т-ры, з 1914 удзельнік «Рускіх сезонаў» за мяжой (арганізатар С. Дзягілеў). Стварыў дэкарацыі да спектакляў «Месяц у вёсцы» І. Тургенева (1909), «Мікалай Стаўрогін» паводле Ф. Дастаеўскага (1913), «Гора ад розуму» А. Грыбаедава (1914; усе ў МХТ). Адзін з арганізатараў Вял. драм. т-ра ў Петраградзе, афарміў у ім «Разбойнікаў» Ф. Шылера (1919), «Караля Ліра» У. Шэкспіра (1920) і інш. У 1923—24 выкладаў у Віцебскім маст. тэхнікуме.

Літ.: История русского искусства, т. 10, кн. 1, М., 1968, с. 431—444.

ДАБУЧЫН, старажытная назва г. *Пружаны*.

ДАБШЭВІЧ Бенядзікт (12.3.1722 — г. см. невяд.), філосаф і матэматык, прадстаўнік кампраміснага кірунку ў натурфіласофіі. Праф. Віленскай акадэміі. Прызнаваў філас. і прыродазнаўчанавуковыя ідэі П. Гасендзі, Р. Дэкарта, Г. Галілея, І. Кеплера, І. Ньютана, Г. Лейбніца, Х. Вольфа, імкнуўся захаваць схаласт. схемы і паняцці. У агульнафілас. пытаннях блізкі да рацыяналізму Вольфа і Дэкарта, часта звяртаўся да сенсуалізму Дж. Лока. Лічыў, што веды павінны грунтавацца на відавочнасці (эвідэнцыі). Прызнаваў тры віды пазнання: гістарычнае (пазнан-

не фактаў, іх успрыняцце), філасофскае (раскрыццё прычыны і асновы існавання прадмета) і матэматычнае (пазнанне колькасных адносін). Паводле Д., мэта навукі — дасягненне ісціны для карысці чалавека. Ісціну падзяляў на лагічную, метафіз. і маральную. Лічыў, што для філасофіі вял. значэнне мае матэматыка, без якой немагчыма правільнае мысленне. Адзін з першых прапагандаваў новую навуку і філасофію на Беларусі і ў Літве.

Тв.: Placita recentiorum philosophorums, Vilnae, 1760; Praelectiones logicae..., Vilnae, 1761.

Літ.: История и методология естествознания, Мн., 1966, с. 22, 26—27. *Э. К. Дарашэвіч.* Мінск.

ДАВАТАР Леў Міхайлавіч [7(20).2.1903, в. Хоціна Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 19.12.1941], генерал-маёр (1941). Герой Савецкага Саюза (21.12.1941).



З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1939). У Чырв. Арміі з 1924. З 1939 нач. штаба кав. палка, потым кав. брыгады і дывізіі. У Айч. вайну на Зах. фронце — камандуючы асобнай кав. групы, якая зрабіла глыбокі рэйд па тылах ворага ў Смаленскай вобл. (жн.— вер. 1941). У вер. 1941 група рэарганізавана ў кав. корпус, які вёў абарончыя баі на р. Мёжы, прыкрываў адыход сав. войск на Валакаламскім напрамку; удзельнічаў у арганізацыі абароны на р. Ламе па ўчастку ад Ярапольца да Маскоўскага мора, у контрнаступленні пад Масквою з раёна Кубінкі на Рузскім напрамку. 19.12.1941 кав. корпус на чале з Д. імкнуўся з ходу фарсіраваць Рузу на ўчастку Талбузіна — Палашкіна і прарваць варожую абарону. Загінуў у баі каля в. Палашкіна на Пн ад г. Рузы. На месцы гібелі Д., у в. Хоціна, на магіле на Новадзявочых могілках у Маскве пастаўлены помнікі. У г. п. Ула Бешанковіцкага р-на БССР адкрыты мемарыяльны музей Д.— філіял Віцебскага абл. краязнаўчага музея. Імем Д. названы вуліцы ў Маскве, Мінску, Віцебску і інш. гарадах. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі.

Літ.: Тюленев И. В. Советская кавалерия в боях за Родину, М., 1957; Федоров П. Генерал Доватор, М., 1963; Толоконьников Г. А. Человек легенды, М., 1966. *У. К. Коршук.* Мінск.

ДАВЕРАНАСЦЬ, дакумент, паводле якога адна асоба (грамадзянін ці арг-цыя) упаўнаважвае другую (прадстаўніка) зрабіць ад яго імя пэўныя дзеянні ў адносінах да трэціх асоб.

Кр.: Грамадзянскі кодэкс Беларускай ССР, Мн., 1965, арт. 66—72.

ДАВІД (David) Жак Луі (30.8.1748, Парыж — 29.12.1825), французскі жывапісец. Заснавальнік рэвалюц. класіцызму ў франц. мастацтве. У 1766—74 вучыўся ў Парыжы ў Каралеўскай акадэміі жывапісу і скульптуры (чл. акадэміі з 1784), у 1775—80 у Італіі. Актыўны дзеяч рэвалюцыі 1789—94, чл. якабінскага Канвенту. Стварыў Нац. музей у Луўры. Прынцыпы класіцызму перадрэвалюц. эпохі найпаўней выявіліся ў яго гістар. карціне «Клятва Гарацыяў» (1784), якую грамадскасць успрыняла як заклік да барацьбы. Творам Д. 80-х г. («Смерць Сакрата», 1787) уласцівыя ўзвышанасць задумы, сцэн. ўрачыстасць вобразнага строю, барэльефная пабудова кампазіцыі. Натхнёны гераікай рэвалюцыі 1789—94, Д. імкнецца да стварэння гістар. карціны на сучасную тэму («Клятва ў зале для гульні ў мяч», 1791). Карціны «Забіты Лепелецье» (1793) і асабліва «Смерць Марата» (1793) з яе трагічным гучаннем, суровым лаканізмам формаў становяцца помнікамі гераям рэвалюц. эпохі, аб'ядноўваюць рысы партрэта і гістар. карціны. Вял. рэаліст. сілай вызначаюцца партрэты Д. (аўтапартрэт, 1794; «Зяленіўшчыца», 1795). З 1804 Д. стаў прыдворным мастаком Напалеона, пісаў халодна-эфектныя карціны («Каранацыя», 1805—07), парадныя партрэты («Напалеон пры пераходзе праз Сен-Бернар», «Мадам Рэкам'е», абодва 1800). У пач. 19 ст. Д. стаў вядучай фігурай франц. акадэмізму. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Ампір, Гістарычны жанр, Францыя.*



Літ. тв.: Рус. пер.— Речи и письма живописца Луи Давида, М.—Л., 1933.

Літ.: Кузнецова И. А. Луи Давид, М., 1965; Замятина А. Н. Давид, М.—Л., 1936.

ДАВІДЗЕНКА Аляксандр Аляксандравіч [1(13).4.1899, Адэса — 1.5.1934], рускі савецкі кампазітар. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў Маск. кансерваторыю (1929). Вёў музасветніцкую работу сярод рабочых, калгаснікаў, чырванафлотцаў. У цэнтры творчасці Д.— тэмы рэвалюцыі і стваральнай працы. Яго масавыя песні («Конніца Будзённага», «Першая конная», «Вінтовачка», «Нас пабіць, пабіць хацелі») і хар. кампазіцыі («Вуліца хвалюецца», «На дзесятай вярсце», «Рабочы май», «Падыманне вагона», «Мора шалёна стагнала») вызначаюцца плакатнасцю, дынамізмам, актыўным ператварэннем нар.-песенных інтанацый, багаццем поліфанічнай фактуры. Аўтар опер «1919 год» (1930), «1905 год» (разам з Б. Шэхтэрам, 1933).

Літ.: Александр Давиденко. Воспоминания. Статьи. Материалы, Л., 1968.

ДАВІДЗЮК Георгій Пятровіч (н. 5.7.1923, в. Камень-Шляхецкі Кобрынскага пав. Палескага ваяводства), беларускі савецкі філосаф. Д-р філас. н. (1969), праф. (1970). Чл. КПСС з 1945. Скончыў Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага (1952) і Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1959). У 1959—62 лектар ЦК КПБ. З 1962 заг. сектара гістар. матэрыялізму, з 1968 сектара сацыялагічных даследаванняў Ін-та філасофіі і права АН БССР. Даследуе праблемы буржуазнай сацыялогіі, класавую структуру СССР, сацыялагічныя праблемы вёскі.

Тв.: Ленінізм — вострая зброя барацьбы з рэвізіянізмам, Мн., 1960; Основные черты современного ревизионизма, Мн., 1961; Несовместимость религиозной идеологии и коммунизма, Мн., 1963; Формирование научного мировоззрения, у кн.: Строительство коммунизма и социальные изменения в крестьянстве Белоруссии, Мн., 1966; Банкрутства буржуазных канцэпцый грамадства будучага, Мн., 1967; Критика теории «единого индустриального общества», Мн., 1968; Марксісцкая ідэалогія і буржуазная дэідэалагізацыя, Мн., 1970.

ДАВІД БУДАЎНІК (Давід IV Георгіевіч; каля 1073—25.1.1125), грузінскі цар [1089—1125] з дынастыі *Багратыёні*. Яго барацьба супраць іншаземных захопнікаў і феад. арыстакратыі спрыяла аднаўленню незалежнасці Грузіі, аб'яднанню груз. княстваў у адзіную дзяржаву. У Дыдгорскай бітве 1121 разбіў сельджукаў, у 1122 вызваліў г. Тбілісі і перанёс туды сталіцу. Правёў рэформы суда, царк. і адм. кіравання, стварыў рэгулярнае войска з полаўцаў. Садзейнічаў развіццю гандлю, буд-ву гарадоў, дарог, заснаваў у Гелаты акадэмію, што спрыяла росквіту эканомікі і культуры. За стваральную дзейнасць прызваны Будаўніком.

ДАВІДОВІЧ Ісак Аронавіч [н. 4(17).12.1911, г. Бабруйск], беларускі савецкі жывапісец і графік. Скончыў Віцебскі маст. тэхнікум (1930). Вучань М. Эндэ і В. Рупая. Удзельнік Айч. вайны. Асн. творы: карціны «Карагод» (1937), «Курлоўскі расстрэл» (1939), «Раптоўна» (1946), «Прывал партызанаў» (1948), «За Радзіму» (1949), «Маці» (1955), «Наша будучае сяло» (1961), «Вялікі пачын. Ленін на суботніку» (1960), «Нарачанская быль» (1967), «Салдаты» (1970); графічны цыкл, прысвечаны Леніну; ілюстрацыі да «Карэйскіх казак» (1954), кніг А. Вялюгіна «Вецер з Волгі» (1963), І. Навуменкі «Сасна пры дарозе» (1962), М. Танка «Сярод лясоў наднёманскіх» (1963). Стварыў дэкар. роспіс у фае Бел. т-ра юнага гледача (1955) і пано «Беларускія майстры» ў канферэнц-зале Бел. т-ва дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі (1956; абодва з І. Ахрэмчыкам). У Дзярж. музеі БССР 15 работ мастака.

І. А. Давідовіч. Нарачанская быль. 1967. Дзярж. маст. музей БССР.



ДАВІДОВІЧ Лілія Міхайлаўна (н. 25.12. 1936, Гродна), беларуская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1968). Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (педагог К. Саннікаў, 1960) працуе ў т-ры імя Я. Купалы. Узрушанасць, вонкавая яркасць і выразнасць у першых ролях (Вера — «Любоў, Надзея, Вера» П. Васілеўскага, Маша — «Першая старонка» Н. Іванцар) выявілі здольнасці актрысы стварацьмоцныя, валявыя характары. Найб. поўна гэтыя якасці раскрыліся ў ролі Ганны («Людзі на балоце» паводле І. Мележа, Дзярж. прэмія БССР 1966 за выкананне ролі ў тэлевізійнай пастаноўцы). З інш. роляў: Дыяна («Канец — справе вянец» У. Шэкспіра), Валька («У мяцеліцу» Л. Лявонава), Вольга («Блакада» У. Іванава), Насця («На дне» М. Горкага), Юлія Тугіна («Апошняя ахвяра» А. Астроўскага).

ДАВІДОЎСКІ Іван Елізаравіч [18(30).5.1896, мяст. Грозаў Слуцкага пав. Мінскай губ.— 15.4.1960], генерал-лейтэнант (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1925), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1948). У арміі з 1916. У Чырв. Арміі з лютага 1918. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1936—38 у БВА. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Брансkім, Зах., 2-м і 1-м Бел. франтах — камандзір дывізіі, нам. камандуючага арміі. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Рослаўля, Шклова, Магілёва, Мінска. З 1945 нам. камандуючага Смаленскай ваен. акругі. У 1946—56 выкладчык Ваен. акадэміі Ген. штаба. З 1956 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 10 інш. ордэнамі, медалямі, замежным ордэнам.



ДАВІЛЬНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ (выціскальная вытворчасць), выраб танкасценных пустых прадметаў (напр., вёдраў, бакаў і інш.) абцісканнем лісtавых загатовак на выціскальных станках. Ужываецца ў маласерыйнай або паштучнай вытворчасці. Пры серыйным выпуску вырабаў замяняецца *штампоўкай*.

ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ (г. н. невяд.— п. 1326), палкаводзец і дзярж. дзеяч Вял. кн. Літоўскага, староста ў Гародні (Гродна). Ажаніўся з дачкою вял. князя *Гедыміна* і атрымаў права на карыстанне асобным удзелам. У 1314 разграміў крыжакоў, якія напалі на Навагародак (Навагрудак). У 1318 узначаліў паход гарадзенцаў на Прусію. У 1322—23 памог Пскову ў барацьбе з Лівонскім ордэнам. У 1324 арганізаваў паход войска Вял. кн. Літ. на Мазовію, у 1326 — на Брандэнбург. У апош-

ням паходзе па-здрадніцку забіты мазавецкім рыцарам Андрэем.

Літ.: Антонович В. Б. Монографии по истории Западной и Юго-Западной России, т. 1, Киев, 1885, с. 41—43. *М. І. Ермаловіч.* Маладзечна.

ДАВЫД РАСЦІСЛАВІЧ (1140—97), першы віцебскі князь (з 1165), сын Расціслава Мсціславіча. Княжыў у Ноўгарадзе (1154), Таржку (1159). У 1167 памог полацкаму кн. Усяславу Васількавічу ў барацьбе з мінскім кн. Валадарам Глебавічам. У 1180—97 княжыў у Смаленску, ваяваў з Полацкам. У 1180 памагаў залежнаму ад яго друцкаму кн. Глебу Рагвалодавічу, але адышоў пад націскам аб'яднаных сіл полацкіх князёў, якія дзейнічалі ў саюзе з інш. рус. князямі. У 1195 зноў разбіты палачанамі. Д. Р. лічаць заснавальнікам г. Мсціслава. Перад смерцю прыняў манаства.

Літ.: Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1959; Тихомиров М. Н. Древнерусские города, 2 изд., М., 1956. *М. І. Ермаловіч.* Маладзечна.

ДАВЫД УСЯСЛАВІЧ, полацкі князь [1101—1128], сын Усяслава Брачыславіча. У 1103 у складзе кааліцыі паўднёварускіх князёў удзельнічаў у паходзе супраць полаўцаў, а праз год выступаў супраць свайго брата мінскага кн. *Глеба Усяславіча.* У 1106 разам з братамі Барысам і Глебам пацярпеў паражэнне ад земгалаў. У 1128, калі кіеўскі кн. Мсціслаў Уладзіміравіч з вял. войскам рушыў на Полацк, палачане прагналі Д. У. з княжання. Траіў у палон, праз 2 г. з інш. полацкімі князямі высланы ў Візантыю.

Літ.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966; Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 1 (т. 1—2), М., 1959 (гл. Паказальнік імён).

ДАВЫДАЎ Абрам Мордухавіч [н. 1(13).5.1899, г. Себеж Віцебскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1957), праф. (1959). У 1926 скончыў мед. ф-т 2-га Маскоўскага ун-та. У 1931—46 у Сав. Арміі. Працаваў асістэнтам і дацэнтам у клініцы ўнутраных хвароб 2-га Маскоўскага мед. ін-та (1946—52). Выкладчык курсаў удасканалення ўрачоў Маскоўскай ваен. акругі (1953—56). З 1957 заг. кафедры факультэцкай тэрапіі Віцебскага мед. ін-та. Асн. працы па сардэчна-сасудзістыя змены пры гіпертанічнай хваробе, па атэрасклерозе, хранічнай недастатковасці крывазвароту.

Тв.: Динамика венозного давления и скорости кровообращения в клинике гипертонической болезни, «Терапевтический архив», 1957, № 7; (разам з А. Д. Горбачам) Применение электрокимографии в клинике внутренних болезней, «Здравоохранение Белоруссии», 1969, № 3.

Літ.: Профессор А. М. Давыдов, «Здравоохранение Белоруссии», 1969, № 8.

ДАВЫДАЎ Андрэй Якаўлевіч (н. 5.12.1923, в. Салаўіха Барнаульскага пав. Алтайскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941. Вызначыўся каля Лоева Гомельскай вобл. 20.10.1943 экіпажы Д. і М. В. *Радчанкі* фарсіравалі Дняпро, па танках прайшлі ў тыл ворага на 20 *км*, цэлыя суткі адбівалі контратакі праціўніка. Жыве ў в. Салаўіха Алтайскага краю.

ДАВЫДАЎ Валянцін Канстанцінавіч (н. 22.7.1934, в. Уласава Чарапавецкай акругі Ленінградскай вобл.), беларускі савецкі артыст балета. Нар. арт. БССР (1964). Скончыў студыю класічнага танца пры Ленінградскім Палацы культуры імя М. Горкага (1955), працаваў у оперных т-рах Алма-Аты, Душанбе і Пярмі, з 1957 вядучы танцоўшчык Бел. т-ра оперы і балета. З роляў: Зігфрыд, Дэзірэ, Прынц («Лебядзінае возера», «Спячая красуня», «Шчаўкунок» П. Чайкоўскага), Базыль («Дон Кіхот» Л. Мінкуса), Феб («Эсмеральда» Ц. Пупі), Лені («Сцежкаю грому» К. Караева), Спартак («Спартак» А. Хачатурана), Рамэо («Рамэо і Джульета» С. Пракоф'ева), Мікалай, Андрэй і Алесь у нац. балетах «Мара» Я. Глебава, «Падстаўная нявеста» і «Святло і цені» Г. Вагнера. Артыст лірыка-драм. плана, яго выканальніцкі стыль вызначаецца высакародствам і чысцінёй формы, выразнасцю і эмацыянальнасцю.





В. К. Давыдаў у ролі прынца Дэзірэ ў балеце «Спячая красуня».

Ю. М. Чурко. Мінск.

ДАВЫДАЎ Дзяніс Васілевіч [16(27).7.1784, Масква — 22.4(4.5).1839], герой Айч. вайны 1812, рускі паэт і ваенна-гістарычны пісьменнік. З дваран. На вайск. службе з 1801. Удзельнічаў у войнах з Францыяй (1807), Фінляндыяй (1809). Ініцыятар і адзін з арганізатараў партыз. руху ў тыле ворага. Атрад кавалерыстаў-партызанаў на чале з Д. 9 ліст. ў г. Копысі знішчыў варожы атрад, 285 салдатаў узяў у палон і захапіў вялікі абоз; пераправіўшыся цераз Дняпро, выслаў атрады партызанаў да Шклова і Оршы. 14 снеж. ў Гродне ўзяў у палон 660 французаў, вызваліў з палону 467 раненых рус. салдатаў і 14 афіцэраў і захапіў склады з харчамі. Пасля вайны камандаваў Ахтырскім гусарскім палком. Удзельнік рус.-іранскай вайны 1826—28, задушэння нац.-вызв. паўстання 1830—31. У 1832 выйшаў у адстаўку ў званні ген.-лейт. Аўтар вершаў і гістар. артыкулаў. У рамане Л. Талстога «Вайна і мір» Д. выведзены ў вобразе Давыда Дзянісава.

Тв.: Соч., М., 1962; Стихотворения, Л., 1959.

Літ.: Жерве В. В. Партизан-поэт Денис Васильевич Давыдов, СПб., 1913; Орлов В. Денис Давыдов, М., 1940; Задонский Н. А. Денис Давыдов, М., 1968. *Я. І. Карнейчык.* Мінск.

ДАВЫДАЎ (Давідаў) Карл Юльевіч [3(15).3.1838, Гольдынген, Курляндыя — 14(26).2.1889], рускі віяланчэліст і кампазітар. Заснавальнік рус. віяланчэльнай школы. У 1860—62 праф. кансерваторыі і канцэртмайстар аркестра Гевандхаўза ў Лейпцызе, у 1862—87 праф., у 1876—87 дырэктар Пецярбургскай кансерваторыі. Шмат канцэртаваў як саліст і ўдзельнік квартэта Рус. муз. т-ва. Аўтар школы (1888) і твораў для віяланчэлі, струнных квартэтаў, сімф. паэмы «Дары Церака», рамансаў.

Літ.: Гинзбург Л., К. Ю. Давыдов, М.—Л., 1950; Гутор В. П., К. Ю. Давыдов как основатель школы, М.—Л., 1950.

ДАВЫДАЎ Ладо Шырынтаевіч (н. 3.1.1924, Уладзікаўказ), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў баях на тэр. Віцебскай вобл. 25.6.1944 з групай разведчыкаў пад агнём праціўніка фарсіраваў Зах. Дзвіну. У баі за в. Шарыпіна захапіў важныя штабныя дакументы ворага. Жыве ў Маскве.

ДАВЫДАЎ Мікалай Сяргеевіч (2.11.1921, в. Вялікае Андосава Сяргацкага пав. Ніжагародскай губ.— 16.8.1949), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1940. На фронце з 1943, камандзір авіяэскадрыллі. Вызначыўся пры вызваленні Віцебска, Оршы, Мінска і ліквідацыі Мінскага «катла». Зрабіў 187 баявых вылетаў. Загінуў у авіяцыйнай катастрофе. На радзіме яго імем названа школа.

ДАВЫДАЎ Уладзімір Мікалаевіч [сапр. Іван Мікалаевіч Гарэлаў; 7(19).1.1849, Навамірград — 23.6.1925], рускі акцёр і педагог. Нар. арт. РСФСР (1922).



З 1880 у Александрынскім т-ры (Пецярбург). Акцёр вял. культуры, шырокага дыяпазону, пераважна камед. таленту. У мастацтве Д. арганічна спалучаліся слова, міміка і жэст, востры псіхал. аналіз з віртуознай тэхнікай. Лепшыя ролі ў рус. класічным рэпертуары: Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабыліна), Фамусаў («Гора ад розуму» А. Грыбаедава), Гараднічы, Падкалесін («Рэвізор», «Жаніцьба» М. Гогаля), Хлынаў («Гарачае сэрца» А. Астроўскага), Чабутыкін («Тры сястры» А. Чэхава). З 1883 педагог тэатр. вучылішча (Пецярбург).

Літ. тв.: Рассказ о прошлом, Л.—М., 1962.

Літ.: Брянский А., В. Н. Давыдов. 1849—1925. Жизнь и творчество, Л.—М., 1939.

ДАВЫДАЎ Фёдар Мікалаевіч (н. 1906, Шадрынскі пав. Пермскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У кастр. 1943 адзін з першых фарсіраваў Дняпро каля Лоева, захапіў варожы кулямёт, агнём падтрымліваў пераправу пяхоты. Жыве ў Катайску Курганскай вобл.


ДАВЫДАЎКА, вёска ў Гомельскім р-не, каля р. Сож (2 *км*). Цэнтр сельсавета. За 7 *км* на ПдЗ ад Гомеля, каля шашы Гомель — Калінкавічы (1 *км*). 198 ж., двароў 73 (1971). Адда. торфапрадпр. «Парыжская камуна», швейная і шавецкая майстэрні. Васьмігадовая школа, сярэдняя школа рабочай моладзі, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 3 магазіны.

ДАВЫДАЎКА, вёска ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Іпа (2 *км*). Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на ПдЗ ад Светлагорска, 135 *км* ад Гомеля, 9 *км* ад чыг. ст. Жэрдзь. 198 ж., двароў 73 (1971). Сярэдняя школа, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі, магазін. Заснавана Д. ў 1847. Помнікі на дзвюх брацкіх магілах — 446 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну, і 86 сав. грамадзян, 8.2.1942 загубленых ням.-фаш. карнікамі.

ДАВЫДАЎСКАЕ РАДОВІШЧА КАМЕННАЙ СОЛІ, каля в. Давыдаўка Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. Выяўлена ў 1941 глыбокай (1010,7 *м*) свідравінай.

Каменная соль звязана з верхнедэвонскай галагеннай фармацыяй. Залягае на глыб. 824,5—842,5 *м* ад зямной паверхні і стварае пакатае падняцце, якое цягнецца ў блізкім да шыротнага напрамку з вугламі нахілу на крылах не больш за 11°. На радовішчы прабіты 4 свідравіны глыб. ад 1010,7 да 1301,3 *м*. Падэшва адкладаў солі паводле прамыслова-геафіз. даследаванняў на глыб. ад 1436 *м* да 3120 *м*. Запасы солі паводле падлікаў на пл. 7 *км*² па пластах агульнай магутнасцю ад 95 *м* да 212 *м* больш за 20 млрд. *т*. Горнатэхн. і гідрагеал. ўмовы для распрацоўкі добрыя. Пры здабычы солі вышчалочваннем можна атрымаць спажыўную соль высокай якасці.

ДАВЫДАЎСКАЕ РАДОВІШЧА НАФТЫ, у Светлагорскім раёне Гомельскай вобл., за 20 *км* на ПдЗ ад Светлагорска, каля в. Давыдаўка. Пл. 32 *км*². Асн. нафтаносны гарызонт складзены з даламітаў і даламітызаваных вапнякоў задонскіх (міжсалявых) адкладаў дэвону. Нафту змяшчаюць таксама даламіты і



Геалагічны разрэз Давыдаўскага радовішча нафты: *1* — геалагічныя межы; *2* — лініі стратыграфічнай неадпаведнасці; *3* — тэктанічныя парушэнні; *4* — крышталічны фундамент; *5* — свідравіны; *6* — паклады нафты. Адклады рознага ўзросту: *K z+M z+P* кайназойскія, мезазойскія і пермскія; верхнедэвонскія (*D* $\frac{3}{3}$*d*— данкаўскі гарызонт, D^3_2*el-lb* — ялецка-лебядзянскі, D^3_2*zd-el* — задонска-ялецкі, D^1_3*lv* — ліўенскі гарызонты, D^1_3*n. c.*— падсалявал тоўшча); D^2_2— сярэднедэвонскія, *Pt*₃ — верхнепратэразойскія.

антідрыты ў ніжняй ч. верхняй салянаснай тоўшчы. Глыбіня залягання нафтаносных гарызонтаў 2530=2670 м. Шчыльн. нафты 861=885 кг/м³, змяшчае серы 0,15=0,20%.

Нафтаносная структура вывучана ў 1946 геафіз. даследаваннямі. Каталаснае вывучэнне пачалося ў 1965, першае свідраванне ў 1967, разведачнае ў 1968. Радовішча размешчана ў паўн. ч. Прыпяцкай упадзіны, у межах адной тэктанічнай зоны разам з Рачыцкім, Прыазёрскім, Летцкавіцкім і Вішанскім радовішчамі нафты і солей Вішанскай і Летцкавіцкай плошчаў. У разрэзе даследаваных адкладаў дзве салянасныя тоўшчы. Верхняя тоўшча солей (магутнасць 1700=2000 м) перакрываецца надсольевымі галіта-карбанатнымі адкладамі (300=400 м). Міжсольевая тоўшча (800=850 м) складзена перакладамі і карбанатных парод. Ніжняя салянаная тоўшча (200=800 м) падсцілаецца падсольевымі адкладамі верхняга дэвону (200=250 м), перакрытымі ў дальнейшу і напаўсюдна, і толькі ў цэнтр. ч. ўчастка ў выгляду галіта і ангідрыта. В пд. раёнах. абмежавана разломным парушэннем з амплітудай ніжн. 700=800 м.

Н. Ф. Грабоўская, Мінск.

ДАВЫД-ГАРАДОК, горад у Столінскім р-не Брэсцкай вобл., прыстань на р. Гарынь (прыток Прыпяці). За 35 км на ПнУ ад Століна, 280 км ад Брэста, 41 км ад чыг. ст Гарынь. Аўтобусная станцыя. 8,9 тыс. ж. (1970).



Давыд-Гарадок. Вуліца Савецкая.

Паводле археал. даследаванняў узнік у пач. 12 ст. на горадзе Кіеўскай Русі Мячыслава, назва ад імя валынскага кн. Давыда Ігаравіча, які атрымаў ва валоданне Пагарынне. Умацаваны драўляны замак. На тэр. горада пры ўмацаванні ў Напаўдня (перасыпі) у Гарынь абмеркаваны старан. гарадзішча круглай формы, умацаванае ровам і валам. Цэнтр рамяства. У 1947=60 і П. ф. Лысенка (1967) вызначаны гаршчкі шэрыя і гнеі, набудову, вуліцы, месцазнаходжанне ганчарных майстэрань, сямейальных пахаванняў. Знаходкі свядчаць пра развіцце рамяства (шкло- і дрэваапрацоўчага, каляровага, гарбарнага, ювелірнага, ганчарнага), гандлю, сувязей з Польшчай, Прыбалтыкай. Упамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1149 г. як горад Давыда Ігаравіча. Згадваецца ў граматах Вял. кн. Літоўскага Казімера 1447 г. пра межы Давыд-Гарадка з Пінскам. Пасля 1521 г. Давыд-Гарадок у складзе Пінскага княства. Цэнтр воласці (1528=54) (гл. Давыд-Гарадоцкая воласць). У рэвізіі пінскіх уладанняў 1552=53 (гл. Давыд-Гарадоцкая воласць). У рэвізіі пінскіх уладанняў 1554=57 згадваецца пінскім князем Р. Тышкевічам (1556), а ў 1563 у складзе Рэчы Паспалітай. Цэнтр павета Мінскага ваяв. У 1566 павятовы цэнтр Мінскай зямлі. У 1566 мянт. Мажэйкі Д.-Г. У 1598 у Д.-Г. павет (стан, ст., у 1907=18 917 ж., 1917 — 1 000 ж.). Пасля 1793 у Расіі, з 1917 у БССР. У 1918 акупіраваны нямецкімі войскамі. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 адышоў да Польшчы. Пасяліўся ў мястэчку Давыд-Гарадок Пінскага павета Палескага ваяводства. Вядомы прадпрыемствы Д.-Г. райпрамкамбінат, райаграпрамкамбінат, райсельгастэхніка, райсельгасхімія, райсельгасаб'яднанне, райсельгасбудтрэст, райсельгасбудматэрыялы, райсельгасбудкамбінат, райсельгасбудкамбінат, райсельгасбудкамбінат

Пасля звароту Сав. ўрада 9(22).11.1917 па радыё да салдатаў і матросаў з заклікам узяць справу міру ў свае рукі ВРК Зах. фронту прапанаваў армейскім і карпусным ВРК неадкладна пачаць перагаворы з ням. войскамі. Да сярэдзіны ліст. большасць злучэнняў фронту заключыла дагаворы аб перамір'і на сваіх участках. 19.11(2.12).1917 у штаб ням. Усх. фронту для перагавораў выехала дэлегацыя Зах. фронту з 16 чал., у т. л. Л. С. Я. Шчукін, В. В. Фамін, С. І. Берсан, М. С. Ціхменеў, М. Р. Пятроў. 21.11(4.12).1917 паміж 2, 3 і 10-й арміямі Зах. фронту і ням. арміямі падпісаны дагавор аб перамір'і на 2 месяцы. Ён набыў сілу з 12 гадзін 23 ліст. на ўсім Зах. фронце ад мяст. Відзы да р. Прыпяць (уключна). Страціў сілу 2(15).12.1917 у сувязі з заключэннем дагавору аб перамір'і з Германіяй. Гл. *Брэсцкі мір 1918.*

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 2, Мн., 1957; Петров Н. Большевики на Западном фронте в 1917 году. Воспоминания, М., 1959.

Э. М. Савіцкі. Мінск.

ДАГАВО́Р АБ УТВАРЭННІ СССР, дзярж. акт, якім разам з *Дэкларацыяй аб утварэнні СССР* аформлена добраахвотнае аб'яднанне незалежных савецкіх сацыялістычных рэспублік (РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР) у адну дзяржаву — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Прыняты 30.12.1922 на Першым з'ездзе Саветаў Саюза ССР. Утварэнню СССР папярэднічала шырокае абмеркаванне гэтых пытанняў у саюзных рэспубліках. Прапанову пра аб'яднанне ўхваліў *Чацвёрты з'езд Саветаў Беларусі* 18.12.1922. Паводле дагавору вярх. орган СССР — з'езд Саветаў СССР, а ў перыяд паміж з'ездамі — Цэнтр. Выканаўчы Камітэт СССР (ЦВК СССР). ЦВК СССР выбіраў Прэзідыум, у склад якога ўваходзіла 4 старшыні ЦВК — ад колькасці саюзных рэспублік. ЦВК выбіраў Савет Народных Камісараў (СНК СССР). Дагавор прадугледжваў стварэнне 10 саюзных наркаматаў, Вярх. Суда і Аб'яднанага галоўнага паліт. ўпраўлення (АГПУ), вызначыў асновы ўзаемаадносін паміж вышэйшымі органамі ўлады СССР і саюзных рэспублік. Асн. палажэнні дагавору замацаваны ў Канстытуцыі СССР.

Літ.: Козлов В. И. Союз свободных и равных, М., 1964; Златопольский Д. Л. СССР — федеративное государство, М., 1967.

ДАГАВО́Р МІЖНАРО́ДНЫ, палітычнае, эканамічнае ці інш. пагадненне дзвюх або некалькіх дзяржаў. Вызначае правы і абавязкі дагаворных бакоў.

Віды Д. м.: трактаты, пакты, дэкларацыі, канвенцыі, пагадненні, пратаколы і інш. Складаецца з прэамбулы, асн. тэксту і заключэння. У Д. м. падзеляюць, з якога часу ён набывае сілу, і тэрмін дзеяння. Заключаецца ад імя кіраўніка дзяржавы ці ўрада і падпісваецца спец. ўпаўнаважанымі асобамі. СССР і сацыялістычныя краіны заключаюць Д. м. на аснове свабоднага волевыяўлення і раўнапраўя бакоў. Імперыялістычныя краіны пры заключэнні Д. м. часта ўжываюць сілу.

Літ.: Талалаев А. Н. Юридическая природа международного договора, М., 1963.

ДАГАВО́Р ПРАЦОЎНЫ, па савецкім заканадаўстве пагадненне, паводле якога адзін бок (грамадзянін) абавязваецца выконваць пэўную работу на канкрэтным прадпрыемстве або ва ўстанове, а другі бок (прадпрыемства, установа) абавязваецца выплачваць заработную плату і забяспечваць усе іншыя ўмовы працы, прадугледжаныя нормамі працоўнага права, калектыўным дагаворам ці працоўным пагадненнем.

Заключэнне Д. п. афармляецца загадам ці прыёмнай запіскай. Зар. плата выплачваецца ў загадзя вызначаным памеры за адзінку часу (пагадзінная аплата), за адзінку выпрацоўкі (адзельная аплата) або за пэўныя колькасныя ці якасныя паказчыкі ў рабоце (прэміяльная заработная плата). У якасці рабочых або служачых прымаюцца асобы, якім споўнілася 16 гадоў. У выключных выпадках па ўзгадненні з ФЗМК прафсаюз могуць быць прыняты на работу 15-гадовыя падлеткі. Асоба, якая ўладкоўваецца на работу, падае адміністрацыі прадпрыемства, установы або арг-цыі пашпарт, прац. кніжку (калі яе няма — адпаведную даведку), дакумент аб адукацыі і інш.

Калгасы маюць права запрашаць работнікаў па Д. п. толькі на выкананне работ, што патрабуюць спец. ведаў і падрыхтоўкі, якіх могуць не мець члены арцелі (інжынераў, тэхнікаў, рахункаводаў і інш.). Запрашаць часовых рабочых на работу ў калгасы можна тады, калі некат. работы (пасяўныя, уборачныя, будаўнічыя) не могуць быць выкананы ў тэрмін членамі калгаса.

Літ.: Абжанов К. Трудовой договор по советскому праву, М., 1964; Левинант Ф. Виды трудового договора, М., 1966. *В. І. Семянкоў.* Мінск.

ДАГАВО́РНЫ АМА́Н, краіна на У Аравійскага п-ва. Гл. *Аман Дагаворны.*

ДАГАВО́РНЫЯ РЭ́КІ, гл. *Міжнародныя рэкі.*

ДАГАМЕ́Я (Dahomey), Рэспубліка Дагамея, дзяржава ў Зах. Афрыцы на паўн. узбярэжжы Гвінейскага заліва. Пл. 112,6 тыс. км². Нас. 2,6 млн. чал. (1969). Сталіца Порта-Нова. Падзяляецца на 6 дэпартаментаў. Паводле канстытуцыі 1968 на чале дзяржавы і ўрада стаіць прэзідэнт. З 1969 усю паўнату ўлады ў краіне мела Дырэкторыя, якая ў 1970 перадала яе Прэзідэнцкай камісіі.




Прырода. Большую частку тэр. займае плато, складзенае з дакембрыйскіх крышталічных парод, перакрытых на Пн і Пд кайназойскімі пясчанікамі. На ПнЗ горы Атакора выш. да 635 м, на Пд прыморская нізіна шыр. 50—100 км. На ўзбярэжжы Гвінейскага заліва многа лагун. Карысныя выкапні: жал. руда, фасфарыты, волата, лігніты, храміты, рутыл, ільменіт, уранавая руда; паблізу ўзбярэжжа пад дном акіяна знойдзена нафта. Клімат на нізіне экватарыяльны з 2 сезонамі дажджоў (май — ліп. і вер.— снеж.), на астатняй тэр. экватарыяльна-мусонны з дажджлівым летнім і сухім зімовым сезонамі. Сярэдняя т-ра студз. каля 24, ліп. каля 30 °С. Ападкаў ад 1000 мм на Пн да 1500—2000 мм на Пд за год. Гал. рэкі Веме і Мекру. Глебы чырвоныя і латэрытныя, на Пд светла-чырвоныя. Пераважаюць саваны з галмі алейнай пальмы, ва ўнутр. раёнах трапляюцца вільготныя трапічныя лясы. У саванах водзяцца антылопы і драпежнікі (леапард, гіена).

Насельніцтва. Асн. насельніцтва Д.— народы гвінейскай і цэнтральнабантоідныя моўных груп (эве, фон, іоруба, барба, сомба, гурма і інш.). Больш за 65% веруючых дагамейцаў трымаюцца традыцыйных стараж. культаў (політэізм), астатняя частка вызнае хрысціянства і іслам. Дзярж. мова французская. Сярэдняя шчыльн. 23,0 чал. на 1 км². Найб. гарады Катану (120 тыс. ж., 1967), Порта-Нова (85 тыс.), Абамей, Канды.


Гістарычная даведка. Першыя паселішчы чалавека на тэр. Д. былі ў эпоху неаліту. Археал. раскопкі сведчаць пра даволі высокі ўзровень матэрыяльнай культуры стараж. насельніцтва. У 15 ст.

тут паявіліся партугальцы, у 17 ст.— галандскія, франц. і англ. купцы і гандляры рабамі. Узбярэжжы Д. і суседніх абласцей сталі буйным раёнам гандлю рабамі ў Афрыцы (адсюль назва ўзбярэжжа — Нявольніцкі Бераг). Першыя звесткі пра дзяржаву Д. з 17 ст. У 1-й пал. 19 ст. яна пачаліла інш. дзярж. аб'яднанні. У выніку жорсткай барацьбы з Партугаліяй і Англіяй, пазней з Германіяй Францыя ўсталявала свой пратэктарат над шэрагам дагамейскіх тэрыторый. У 1893 Д. стала франц. калоніяй, з 1904 у складзе федэрацыі Франц. Заходняя Афрыка. Была ператворана ў краіну монакультуры алейнай пальмы. Каланізатары ўвялі сістэму прымусовай працы. Нар. масы Д. няраз паўставалі супраць іншаземнага прыгнёту (узбр. паўстанне 1915, рух млададагамейцаў пасля 1-й сусв. вайны, масавыя антыімперыяліст. выступленні 1923). Пасля 2-й сусв. вайны паявіліся першыя ў краіне афр. паліт. партыі і прафсаюзы. Калан. ўлады ў 1957 сфарміравалі ў Д. першы Урадавы савет з удзелам афрыканцаў, у 1958 Францыя згадзілася на абвяшчэнне аўтаномнай рэспублікі (у складзе франц. Супольнасці). 1.8.1960 Д. абвешчана незалежнай рэспублікай і выйшла з франц. Супольнасці, але захавала з Францыяй цесныя эканам. і паліт. сувязі. Унутрыпаліт. становішча ў краіне вельмі няўстойлівае, што выяўляецца ў шматлікіх зменах урада. Канстытуцыя, прынятая ў сак. 1968, усталявала прэзідэнцкі рэжым і аднапартыйную сістэму (Саюз за адраджэнне Д. створаны ў 1968). Дыпламат. адносіны з СССР устаноўлены ў 1962. З 20.9.1960 Д.— чл. ААН.




Падача сыравіны на цукровым заводзе.


Гаспадарка. Д.— слабаразвітая агр. краіна з моцным уплывам замежнага (асабліва франц.) капіталу. У с. гасп. занята больш за 92% насельніцтва. Гал. с.-г. культура — алейная пальма. Вырошчваюць арахіс, какосавую пальму, бавоўнік, кававыя дрэвы. Гал. харч. культуры: кукуруза, маніёк, батат, ямс, проса і сорга, фасоля. Вытв. асноўных с.-г. культур (тыс. *т*, 1968): кукуруза 260, бавоўна 8, рыс 2, пальмавы алей 44,4. У 1968 (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 520, авечак 545, свіней 340. Гадуюць зебу, аслоў, коней, курэй. Рыбалоўства (каля 35,6 тыс. *т* рыбы ў 1967). Здабыча невялікай колькасці золата і буд. матэрыялаў. 5 з-даў па вытв. пальмавага алею; бавоўнаачышчальныя з-ды ў Бахіконе, Канды, Савалу, Джугу, Ндалі, Параку. У Бахіконе прадпрыемствы для вырабу мяшкоў з кенафу. У Канды з-д ачысткі капоку. Есць установкі для ачысткі арахісу, рыбакансервавы, мылаварны і керамічны з-ды, тытунёвая ф-ка і інш. прадпрыемствы. 5 невялікіх эл. станцый, 2 лесапільныя з-ды ў цэнтр. частцы краіны, якія перапрацоўваюць 4 тыс. м³ драўніны за год. Невял. прадпрыемствы для вырабу мэблі ў Катану. Прадпр. вытворчасці напіткаў, піва, штучнага лёду, пякарні і прадпр. замарожвання крэветак. Некалькі прадпр. па вытв. металічных канструкцый, катлоў, посуду, металічнай мэблі. Даўж. чыгунак 579 км, аўтамаб. дарог 6 тыс. км (у т. л. 4 тыс. км з цвёрдым пакрыццём). Марскі порт у Катану. Д. вывозіць: прадукты алейнай пальмы, бавоўну, арахіс, ядры карытэ, тытунь і інш. Прывозіць: тавары шырокага ўжытку, харч. тавары, аўтамабілі, абсталяванне. Гал. гандл. партнёр — Францыя. У 1967 экспарт 5,5, імпарт 12,2 млрд. афр. франкаў. Грашовая адзінка — афр. франк.



Асвета. Да 1960 у пач. школах займалася 20% дзяцей школьнага ўзросту, у сярэдніх — 0,5% моладзі ад 13 да 18 гадоў. Пасля 1960 нар. асвета ў краіне расшыраецца. Пач. школа 6-гадовая для дзяцей ад 6 да 12 (14) гадоў. У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах навучалася 139,7 тыс. вуч. Сярэдняя школа: сямігадовы ліцэй, агульнаадук. і тэхн. чатырохгадовыя калежы, с.-г. цэнтры вучнёўства (3 гады). Толькі ліцэі даюць поўную сярэднюю адукацыю і права паступаць у ВНУ. У 1967/68 навуч. г. ў сярэдніх навуч. установах вучыліся 13 тыс. чал. Аднак у сельскіх раёнах краіны вучыцца толькі 12—15% дзяцей, у 1966 было непісьменным 95—98% сельскага дарослага насельніцтва. У 1964 засн. першая ВНУ Д.— юрыдычны ін-т. Н.-д. ўстановы: ін-т прыкладных даследаванняў Д., Дагамейскі ін-т навук. даследаванняў і педагогікі. Гістар. музей у Абамеі.

Літ.: Новейшая история Африки, 2 изд., М., 1968.


ДАГЕСТАНСКАЯ АССР
Масштаб 1:4 000 000
40 0 40 80км
Каспійскае мора
МАХАЧКАЛА
ГРОЗНЫ
ЧЕЧНЯ
ИНГУШ
А С С Р
Каспійск
Буйнакск
Кізляр
Дэрбент
Хасав'юрт
Кізілюрт
Хунзах
Кахібскі
Гімры
Кумух
Кулі
Рутул
Курах
Мехтулі
Кубачы
Ахты
Дакузпара
Шалбуздаг
4466
Сулакскі
Самурскі
Рубас
Кара-Кой
Самур
Кусары
Ахтычай
Рубас
Самур
Сулак
Акташ
Шура-Озень
Казікумухскі
Самурскі
Дзілімскі
Самурскі
Самурскі
Самур



Аварская цыноўка «чыбта» з сяла Урма. 1946; кумган з падносам. Чэрнь, гравіроўка. Работа Г. Магамедава. 1956.

тырай, аварскі паэт Махмуд з Кахаб-Роса. Нац. л-ры (аварская, даргінская, кумыкская, лакская, лезгінская, нагайская, табасаранская, тацкая) у Д. дасягнулі росквіту пасля перамогі Кастр. рэв. Найб. значныя сав. паэты Д.: лезгіны Сулейман *Стальскі*, Тагір Хуругскі, аварцы Гамзат *Цадаса*, Загід Гаджыеў, Расул *Гамзатаў*, Фазу Аліева, кумыкі Абдула Магамедаў, Казіяў-Алі, Анвар Аджыеў, лакцы Абуталіб Гафураў, Эфендзі *Капіеў*, даргінцы Азіз Імінагаеў, Сагід Абдулаеў, Ахмедхан Абу-Бакар і інш. На мовы Д. перакладзены творы Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова і інш.; на бел. мову — творы Стальскага, Гамзатава і інш.

Сярод стараж. арх. збудаванняў — сцены і крэпасці Дэрбенцкай абарончай сістэмы (з 6 ст.), сярод помнікаў сярэдневяковуя — цытадэль Нарын-кала, Джума-мячэць, Ханскі маўзалей і інш. у Дэрбенце; своеасаблівыя паселішчы-аулы з тэрасападобнай забудовай (Кубачы, Чох, Тыдыб і інш.). Зберагліся мячэці, купальныя маўзалеі, вежы, архітэктурна аформленыя крыніцы. У 19 ст. будуюцца гарады Пятроўск-Порт (Махачкала) і Тэмір-Хан-Шура (Буйнакск). У сав. час узнікаюць новыя і добраўпарадкоўваюцца старыя гарады і грамадскія збудаванні. З старажытных часоў (неаліт, эпоха бронзы) пашыраны разьба па камені, роспісная кераміка, маст. апрацоўка металу. Зберагліся сярэдневяковыя каменныя рэльефы і бронзавыя катлы з выявамі жывёл, людзей, сцэн паляванння і інш. Славяцца даг. ювелірныя вырабы і багата аздобленая зброя (аул Кубачы), кераміка (аул Балхар), драўляныя вырабы з інкрустацыяй металам і бісерам (аул Унцукуль), чаканныя вырабы з медзі (аул Гоцатль), дываны, цыноўкі і інш. У сав. час развілося выяўл. мастацтва, пачатак якому далі жывапісцы М. Джэмал, Ю. Малаеў, М. Юнусілаў, скульптар Х. Аскар-Сарыджа. У 50—60-я г. 20 ст. вылучыліся мастакі А. Аўгустовіч, І. Вальшакоў, Г. Канапацкая, К. Мурзабекаў, браты Г. і Г. Сунгуравы, А. Шарыпаў і інш.

Пры самабытнасці муз. мастацтва кожнай нацыянальнасці Д., даг. пар. музыцы ўласцівае значнае адзінства. Вылучаецца гераічны эпас, бытуюць абрадавыя, прац., любоўна-лірычныя песні. Асн. форма вак. выканальніцтва — сольныя спевы з інстр. суправаджэннем. Пераважаюць натуральныя лады. Песням характэрны двухчасткавая форма, пераменны метр з чаргаваннем памераў $^6/_8$ і $^9/_8$. Танц. музыка вылучаецца рытмічнай вастрынёй; побач з разнавіднасцямі лезгінкі існуюць хуткія танцы ў двухдольным метры. З традыц. пар. інструментаў: зурна, дудук, балабан, кшул (духавыя); агач-кумуз, тамур, тара, саз (шчыпковыя); кеманча, чагана (смыковыя); тэп, гавал (ударныя). Своеасаблівая форма нар. муз. прафесійнасці — мастацтва нар. спевакоў-музыкантаў. Пасля 1920 у Д. створаны першыя муз. школы, у 1926 муз. вучылішча. Заснавальнік прафесійнай кампазітарскай школы Г. Гасанаў. Сярод даг. кампазітараў: С. Агабабаў, Н. Дагіраў, М. Канлаеў, С. Керымаў, А. Цурмілава, Ш. Чалаеў. Працуюць сімф. аркестр, аркестр нар. інструментаў, ансамбль песні і танца, філармонія, муз. вучылішча (Махачкала), 12 муз. школ.

Вытокі тэатр. мастацтва — у гульнях і абрадах розных нацыянальнасцей Д. Папулярныя пехлевены (акрабаты, канатаходцы, жанглёры), дамбаі (нар. коміки). У дарэвалюц. гады ў народаў Д. паявіліся аматарскія гурткі, дзейнасць якіх асабліва актывізавалася пасля 1920. У 30-я г. створаны Кумыцкі муз.-драм. т-р імя Салаватава ў Махачкале, Лакскі драм. т-р імя Капіева ў г. Камух, Лезгінскі драм. т-р імя С. Стальскага ў Дэрбенце, у 1943 Аварскі муз.-драм. т-р імя Цадасы ў Буйнакску. Працуюць Рускі драм. т-р імя М. Горкага, т-р лялек (кумыцкая і рус. трупы) у Махачкале. Сярод тэатр. дзеячаў: нар. арт. СССР Б. Мурадава, нар. артысты РСФСР А. Курумаў, М. Кухмазаў, Х. Магамедава, З. Набіева, нар. арт. Даг. АССР і засл. дз. маст. РСФСР Г. Рустамаў, нар. артысты Даг. АССР і засл. артысты РСФСР А. Капейкін, М. Рашыханаў. У т-рах Д. ставіліся бел. п'есы: «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы (Рускі т-р імя М. Горкага, 1955), «Выбачайце, калі ласка!» (Рускі т-р імя М. Горкага, 1954; Аварскі т-р імя Цадасы, 1955, Лакскі т-р імя Капіева, 1955) і «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка (Лакскі т-р імя Капіева, 1961; Лезгінскі т-р імя С. Стальскага, 1962).

Літ.: История Дагестана, т. 1—4, М., 1967—69 (авт. т. 4 — Даниялов Г. Д.); Борьба за установление и упрочение Советской власти в Дагестане. 1917—1921 гг. Сб. документов и материалов, М., 1958; Российская Федерация, М., 1968 (Советский Союз), с. 700—734; История дагестанской советской литературы, т. 1—2, Махачкала, 1967; Бакланов Н. Б. Архитектурные памятники Дагестана, в. 1, Л., 1935; Любимова Г. Н. и Хан-Магомедов С. О. Народная архитектура Южного Дагестана, М., 1956; Кильчевская Э. В. и Иванов А. С. Художественные промыслы Дагестана, М., 1959; Художники Дагестана. [Альбом], Л., 1960; Дебиров П. М. Резьба по камню в Дагестане, М., 1966; Яковлева Л. Искусство горного края, «Художник», 1969, № 6.

В. А. Гімельрэйх (прырода), *А. П. Веверыч* (гаспадарка), *В. Г. Гаджыеў* (гістар. нарыс), *А. К. Ібрагімаў* (культура), *С. Х. Ахмедаў* (літаратура). Махачкала; *М. А. Якубаў* (музыка). Масква.

ДАГЕСТАНСКІ УНІВЕРСІТЭТ імя У. І. Леніна, вышэйшая навучальная ўстанова. Засн. ў 1957 у г. Махачкала на базе Дагестанскага пед. ін-та. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: біялагічны, матэм., фіз., хім., тэхнал., гістарычны, радыётэхн., інж.-буд., філалагічны, замежных моў. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае; ёсць аспірантура. Пры ун-це НДІ фальклору і л-ры; гістар. і біял. музеі, вылічальная лабараторыя, планетарый, бат. сад, б-ка. Прымае да абароны канд. дысертацыі па гуманіт., біял. і фіз.-матэм. навуках.

ДАГЕСТАНСКІЯ МОВЫ, паўн.-ўсх. група *іберыйска-каўказскіх моў*. Пашыраны пераважна ў Даг. АССР, часткова ў суседніх раёнах Азерб. ССР, Груз. ССР і Чэч.-Інг. АССР. Яднаюць авара-анда-цэзскую, ці авара-анда-дыдойскую і лезгінскую групы, лакскую і даргінскую мовы.

Як і ўсім іберыйска-каўказскім, Д. м. характэрны: у фанетыцы — вельмі развітая сістэма зычных; у граматыцы — эргатыўная канструкцыя; большасць Д. м. маюць *іменныя класы*. Літ. моў 5: аварская, даргінская, лакская, лезгінская, табасаранская. Астатнія (у т. л. агульская, андыйская, гінухская, рутульская, удзінская, цахурская, цэзская) не маюць пісьменнасці і ў якасці літаратурнай карыстаюцца рус. і суседнімі Д. м. Пісьменнасць пачала развівацца пасля Кастр. рэв. (спробы стварыць не на некат. мовах былі і раней, аднак не мелі поспеху) спачатку на аснове арабскай, потым лац., а канца 30-х г. рус. графікі.

Літ.: Языки народов СССР, т. 4, М., 1967.

А. Л. Супрун. Мінск.

ДАГІСТАРЫЧНАЕ МАСТАЦТВА, гл. *Першабытнае мастацтва*.

ДАГМАТЫЗМ (ад грэч. dógma меркаванне, палажэнне, рашэнне), аднабаковы, закасцянелы падыход да праблем, ігнараванне складаных спецыфічных і супярэчлівых працэсаў развіцця прыроды і грамадства. Д. ігнаруе гістарызм і канкрэтнасць ісціны — найважнейшыя патрабаванні дыялект. метаду. Пры дагматычным падыходзе з'явы аб'ектыўнага свету і вынікі яго пазнання разглядаюцца як раз назаўсёды дадзеныя, незменныя, мёртвыя ісціны (догмы). Дыялект. і гістар. матэрыялізм — адзіна паслядоўная антыдагматычная філасофія. Класікі марксізма-ленінізма заўсёды выступалі супраць спроб дагматычнага скажэння іх вучэння, паслядоўна падкрэслівалі, што яно — не догма, а кіраўніцтва да дзеяння. «Увесь дух марксізма, уся яго сістэма патрабуе, каб кожнае палажэнне разглядаць толькі (α) гістарычна; (β) толькі ў сувязі з іншымі; (ν) толькі ў сувязі з канкрэтным вопытам гісторыі» (Ленін У. І. Тв., т. 35, с. 202). Д. груба парушае гэтыя патрабаванні, механічна пераносіць тэарэт. палажэнні, правільныя ў адных гістар. абставінах, у іншыя, падганяе рэчаіснасць пад загадзя прынятыя схемы, замест таго каб тэарэт. абагульненні рабіць на аснове аналізу самога жыцця.

Узнікненне Д. звязана з раліг. патрабаваннямі сляпой веры ў бясспрэчныя і ўсім абавязковыя догматы веравучэння, якіх нельга аналізаваць і ўдасканальваць і якія быццам бы царква ўспрыняла праз боскае адкрыццё. Д. выяўляецца ў сляпой адданасці пэўным поглядам і ў перавялічанай ролі абстрактных суджэнняў. Дагматыкі аперыруюць абстрактнымі, адарванымі ад практыкі формуламі і вывадамі, над якія падганяюць жыццё. Памыляюцца Д. ў фетышызацыі некат. агульнавядомых палажэнняў, у нездольнасці дастасаваць іх да канкрэтных выпадкаў рэчаіснасці. Характэрная рыса Д. ў паліт. дзейнасці — выкананне літары марксізма на шкоду яго сутнасці, няўменне спалучаць марксізм з канкрэтнай практыкай рэвалюц. руху. Д. звязаны з суб'ектывізмам, дактрынёрствам, сектанцтвам, талмудызмам і інш. формамі яго выяўлення. Адхіленне ад марксізма Д. звычайна прыкрывае левай фразай. Пад выглядам вернасці марксізму ён прычыніе вялікую шкоду тэорыі і практыцы сацыялізма і ў гісторыі паліт. барацьбы часта злучаецца з *рэвізіянізмам*. Д. у міжнар. рабочым руху звязаны са спробамі падтрымаць і захаваць *культ асобы*. Барацьба з Д. неабходная для ўмацавання адзінства і згуртаванасці камуніст. і рабочых партый, для новага ўздыму сусветнага рэвалюц. руху.

Літ.: Маркс К. Нищета философии, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 4, гл. 2, § 1; Энгельс Ф. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; Ленін У. І. Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме, Тв., т. 31, с. 69—70, 73—74, 80—82 (Полн. собр. соч., т. 41, с. 75—76, 79—80, 87—90); Ягож. Задачы Саюзаў моладзі, там жа; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый, Масква, 5—17 чэрвеня, 1969 года, Мн., 1969.

П. Ф. Пратасеня. Мінск.

ДАДАШАЎ Садых Алекпер аглы [2(15).4.1905, Баку — 24.12.1946], азербайджанскі савецкі архітэктар. Скончыў Азерб. політэхн. ін-т (1929), дзе потым выкладаў. У 30—40-я г. разам з М. Усейнавым стварыў будынкі ЦК КП Азербайджана і Савета Міністраў Азерб. ССР, кансерваторыі, музея імя Нізамі, кінатэатра імя Нізамі і інш. (усе ў Баку); павільён Азерб. ССР на Усесаюзнай с.-г. выстаўцы ў Маскве (1939). Аўтар (з М. Усейнавым) шэрагу даследаванняў па архітэктуры дарэвалюц. і Сав. Азербайджана.

ДАДЗІЕМАЎ Уладзімір Ільіч (н. 8.1.1924, Нова-Беліца), беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1945. Сын гарбара. Вучыўся ў Камуніст. ін-це журналістыкі ў Мінску, у Гродзенскім пед. ін-це. Удзельнік Айч. вайны. Працаваў журналістам. Скончыў Выш. літ. курсы ў Маскве (1958). Друкуецца з 1943. Аўтар рамана пра жыццё рабочых-тэкстыльшчыкаў «Над Нёманам» (1955, новая рэд. 1957), кнігі нарысаў пра будаўнікоў Бярозаўскай ДРЭС «Белазерскі дзённік» (1963) і інш. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Літ.: Герцовіч Я. Дзве рэдакцыі аднаго твора, «Полымя», 1958, № 1; Клышка А. Новы дзень у Надняманні, «Маладосць», 1956, № 1.

ДАДЫШКІЛІЯНІ Атар Міхайлавіч (н. 21.8.1923, Новачаркаск), савецкі балетмайстар. Засл. дз. маст. БССР (1970), засл. арт. РСФСР (1961). Чл. КПСС з 1955. Пасля сканчэння Дзярж. ін-та тэатр. мастацтва (Масква, 1956) гал. балетмайстар Горкаўскага і Чэлябінскага т-раў оперы і балета, з 1965 Бел. т-ра оперы і балета. Паставіў больш за 20 твораў, у т. л. ўпершыню на балетнай сцэне «Маскарад» Л. Лапуціна (Новасібірск, 1956), «Кветку шчасця» Г. Мушэля (Чэлябінск, 1959), «Альпійскую балладу» і «Выбранніцу» Я. Глебава (Мінск, 1967 і 1969). Інш. пастаноўкі Д. ў Бел. т-ры: «Спартак» А. Хачатурана (1964), «Пер Гюнт» на муз. Э. Грыга (1966), «Рамэо і Джульета» С. Пракоф'ева (1968). Работы характарызуюцца пошукамі новых формаў і выразных сродкаў. Напісаў сцэнарыі балетаў «Маскарад», «У імя жыцця», «Пасля балю», «Выбранніца» (з А. Вярцінскім): Выступае і як оперны рэжысёр («Хаваншчына» М. Мусаргскага, Мінск, 1970, і інш.).

Ю. М. Чурко. Мінск.

ДАДЫЯНІ Шалва Мікалаевіч [9(21).5.1874, г. Зестафоні ў Зах. Грузіі — 15.3.1959], грузінскі савецкі пісьменнік і тэатр. дзеяч. Нар. артыст Груз. ССР (1923). Чл. КПСС з 1945. Сын літаратара. З 1893 акцёр, з 1907 рэжысёр Кутаіскага груз. драм. тэатра. У 1908 узначаліў «Перасоўную трупу», якая выступала з рэвалюц. п'есамі перад рабочымі Грузіі, Баку, Новарасійска. Літ. дзейнасць пачаў як паэт (зб. «Іскра», 1892). У ранніх драм. творах і апавяданнях пакаяваў цяжкае жыццё



працоўных ва ўмовах сац. і нац. прыгнёту. У п'есах адлюстраваў рэвалюц. настроі народа: «У падзямеллі» (1905, выд. 1910), «Калі яны балявалі» (1907, паст. 1912), «Гегечкоры» (1915, выд. 1923), «Учарашнія» (1916). У сав. час напісаў 37 (з 50) п'ес. Аўтар першай у груз. л-ры сатыр. камедыі «У самае сэрца» (1928), аптыміст. трагедыі «Тэтнульд» (1931), гістар. раманаў «Юрый Багалюбскі» (1926), «Сям'я Гвіргвіліяні» (1956). Паказ народа як творцы гісторыі — асн. рыса гістар. твораў Д. Пісаў лібрэта опер, літ.-крытычныя і публіцыст. артыкулы, тэатразнаўчыя працы. У 30-я г. наведаў Беларусь. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—2-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Рус. пер.— Юрий Боголюбский, Тбилиси, 1951; Семья Гвиргвилиани, Тбилиси, 1959.

Літ.: Радиани Ш. Шалва Дадиани, Тбилиси, 1958.

ДАДЭ (Daudet) Альфонс (13.5.1840, Нім — 15.12.1897), французскі пісьменнік. Сын збяднелага буржуа. У 1858 пераехаў у Парыж і выдаў зб. вершаў «Закаханыя». Аўтар аўтабіягр. рамана «Малыш» (1868), зб. апавяданняў «Пісьмы з майго млына» (1869) пра сялянскі побыт і прыроду Праванса, раманаў «Нума Руместан» (1881), «Евангелістка» (1883), «Сафо» (1884) і інш., у якіх рэалістычна паказаны сац. заганы бурж.-арыстакр. Францыі. Найб. вядомая трылогія «Тартарэн з Тараскона» (раманы «Незвычайныя прыгоды Тартарэна з Тараскона», 1872; «Тартарэн у Альпах», 1885; «Порт Тараскон», 1890), дзе створаны яркі сатыр. вобраз правінцыяльнага буржуа, хвалька і фанфарона.

Тв.: Бел. пер.— Тартарэн з Тараскона, Мн., 1938; рус. пер.— Собр. соч., т. 1—7, М., 1965.

ДАДЭКАФОНІЯ (ад грэч. dōdeka дванаццаць+phōnḗ гук), метад музычнай кампазіцыі, пры якім у аснову будовы твора кладзецца серыя — выбраная паслядоўнасць усіх 12 гукаў храматычнай гамы як абсалютна раўнапраўных, назбаўленых ладавых сувязей (гл. *Атанальнасць*). З серыі (раду) канструюецца рух гукаў па гарызанталі (у паслядоўнасці) і па вертыкалі (у адначасовых спалучэннях).

Д. ўзнікла ў працэсе развіцця атаналізму як спроба ўнесці элемент упарадкаванасці ў музыку, кампенсаваць страту ладавай арганізацыі гукаў. Распрацавана А. Шонбергам у 20-я г. 20 ст. (элементы Д. сустракаліся і раней), з 50-х г. паступова выцясняецца новымі штучнымі метадамі. Паслядоўнае ўжыванне Д. назбаўляе музыку эмац. выразнасці, нац. акрэсленасці, вядзе да фармалізму.

ДАЁННЕ, працэс атрымання малака ад свойскіх жывёл (кароў, коз, авечак, кабыл, буйваліц, вярблюдзіц).

Доіць 2—3 разы за суткі праз аднолькавы прамежак часу; перад запускам (падрыхтоўкаю да ацёлу) 1 раз. Парушэнне прывычных умоў Д. (спадзявання малака. Старанное выдойванне павялічвае надой малака і працэнт тлушчу ў ім. Для выдойвання 1 *кг* малака неабходна зрабіць 90—100 націскванняў на сасок. Машыннае Д. палягчае працу і павялічвае ле прадукцыйнасць (гл. *Даільная ўстаноўка*).

Літ.: Физиологические механизмы машинного доения, М.— Л., 1964.

ДАЁНКА, драўляная пасудзіна з клёпак, змацаваных абручамі. Адна больш доўгая клёпка служыць ручкай. Іл. гл. ў арт. *Бандарная вытворчасць*.

ДАЖБОГ [ад стараслав. даждь (той, хто дае) і бог], ва ўсходніх і прыбалтыйскіх славян бог сонца і агню, сын *Сварога*, пазней бог земляробства, урадлівасці, дабрабыту. Упамінаецца ў рус. летапісах, у «Слове аб палку Ігаравым». Жаночая паралель — Падага.

ДАЖДЖАВАЛЬНАЯ ЎСТАНОЎКА, агрэгат для распырскавання вады на расліны і глебу. Складаецца з помпы, сеткі водаправодных трубаў і прыстасавання для распырскавання вады. Адрозніваюць далёкаструменныя (струмень вады да 50—80 *м*), сярэднеструменныя (да 25—30 *м*) і кароткаструменныя (да 5—7 *м*). Д. ў. самаходныя і навясныя на трактар наз. дажджавальнымі машынамі.

Д. ў. атрымліваюць ваду ад стацыянарных падземных напорных трубаправодаў на арашальных палях ці ад перасоўных помпавых станцый, якія бяруць ваду з арашальных каналаў і прыродных вадаёмаў. Ужываецца ў *арашальным земляробстве* для дажджавання палёў, садоў, агародаў і інш.

Літ.: Сладков Е. А. Самонапорно-дождевальные оросительные системы, Алма-Ата, 1969.

ДАЖДЖАВЫЯ ЧЭРВІ (земляныя чэрві), група кольчатых чарвей класа малашчацінкавых (Oligochaetae). 5 сям., у якіх больш як 15 000 відаў. У СССР каля 200 відаў (прадстаўнікі сям. Lumbricidae).

Цела Д. ч. ад светла-шэрага да чорна-бурага ці вішнёва-чырвонага колеру, складаецца з 60—300 кольцаў (сегментаў), даўж. 80—30 *см*, таўшчыня да 1,5 *см*. Добра развітыя нервовая, крывяносная, стрававальная, выдзяляльная і полавая сістэмы, органы дотыку, нюху, смаку. Органаў зроку і слуху няма. Дыхаюць скурай. Гермафрадыты. Жывуць у глебе. Жывяцца пераважна рэшткамі раслін. Актыўныя ноччу. Днём выпаўзаюць з зямлі толькі пасля дажджу (адсюль назва). Рыхляць і ўзбагачаюць глебу мінер. рэчывамі, надаюць ёй устойлівую дробнакамякаватую структуру, садзейнічаюць аэрацыі глебы. Некат. Д. ч. прамежкавыя гаспадары ўзбуджальнікаў гельмінтозаў чалавека і с.-г. жывёл.

Літ.: Чекановская О. В. Дождевые черви и почвообразование, М.—Л., 1960. *А. У. Бірг.* Мінск.

ДАЖДЖАМЕР, прылада для збору і вымярэння колькасці ападкаў, што выпадаюць з воблакаў. Гл. *Метэаралагічныя прылады*.

ДАЖЫНКІ, народнае свята канца жніва.

У дарэвалюц. вёсцы святкаванне суправаджалася абрадамі, песнямі, музыкай, танцамі. Апошні сноп жнеі ўпрыгожвалі кветкамі, стужкамі, надзявалі вянкі в каласоў і палявых кветак і з песнямі ішлі ў вёску. Калі канчалі капаць бульбу, святкавалі дакопкі, касіць сена — дакоскі. У сав. час Д. сталі святам ураджаю. На ўрачыстым мітынгу камбайнеры і жнеі апошні ўпрыгожаны сноп звычайна аддаюць старшыні калгаса ці кіраўніцтву саўгаса. Праўленне калгаса, дырэкцыя саўгаса часта прымяркоўваюць да гэтага дня ўручэнне прэмій, падарункаў, падзяк перадавікам вытворчасці. Лепшых працаўнікоў вянчаюць вянкамі са збожжавых каласоў. Пасля наладжваюцца канцэрты, спарт. гульні, танцы. Гл. таксама *Жніўныя песні*.

Г. І. Дулеба. Мінск.

ДАЗІМЕТРЫЧНЫЯ ПРЫЛАДЫ, сістэмы, установкі, прылады для рэгістрацыі і вымярэння радыеактыўных, рэнтгенаўскіх выпрамяненняў і актыўнасці крыніц выпрамянення. Падзяляюцца на тры класы: дазіметры, радыеметры і спектрометры.

Дазіметрамі вымяраецца экспазіцыйная (паглынальная) доза выпрамянення ці магутнасць дозы апрамянення; радыеметрамі — актыўнасць радыеактыўных крыніц і ізатопаў, шчыльнасць патоку іанізуючых часцінак; спектрометрамі — размеркаванне выпрамянення па энергіях, масах часцінак і інш. параметрах. Паводле канструкцыі Д. п. падзяляюцца на індывідуальныя, пераносныя і стацыянарныя. Індывідуальнымі дазіметрамі вымяраецца сумарная доза выпрамянення, якую атрымлівае чалавек у зоне дзеяння выпрамянення. Пераноснымі прыладамі карыстаюцца для вызначэння і вымярэння заражанасці радыеактыўнымі рэчывамі паверхняў розных аб'ектаў; яны маюць аўтаномныя крыніцы сілкавання (напр., эл. батарэі). Дэтэктары выпрамянення (*іанізацыйныя камеры*, лічыльнікі і інш.) стацыянарных Д. п. размяшчаюцца непасрэдна ў зоне выпрамянення, а вымяральныя прыстасаванні — у бяспечным памяшканні. Стацыянарныя Д. п. сілкуюцца ад сеткі пераменнага току.

Д. п. выкарыстоўваюцца для дазіметрычнага кантролю на атамных установках, прамысл. прадпрыемствах, у мед. установах, дзе ўжываюцца крыніцы радыеактыўных выпрамяненняў. Гл. таксама *Гама-прылады*, *Дазіметрыя*.

І. П. Александроўскі. Мінск.

ДАЗІМЕТРЫЯ, раздзел прыкладной ядзернай фізікі, які займаецца вымярэннем дозы выпрамяненняў, здольных іанізаваць асяроддзе, праз якое яны праходзяць, і вымярэннем актыўнасці радыеактыўных прэпаратаў.

У Д. адрозніваюць знешнія і ўнутраныя крыніцы апрамянення. Пры ўнутраным апрамяненні гал. задача Д.— вызначыць гранічна дапушчальныя канцэнтрацыі пры пападанні радыеактыўных рэчываў у арганізм, законы перамяшчэння і выдалення іх з арганізма, а таксама вымераць канцэнтрацыю радыеактыўных рэчываў у вадзе, харч. прадуктах і інш. Метадамі Д. карыстаюцца ў медыцыне, атамнай прамысл. і інш. Гл. таксама *Апрамяненне*, *Дазіметрычныя прылады*.

Літ.: Аглинцев К. К. Дозиметрия ионизирующих излучений, 2 изд., М., 1957; Дозиметрическая, радиометрическая и электронно-физическая аппаратура и ее элементы. Каталог, М., 1968; Дозиметрические и радиометрические методики, 2 изд., М., 1966.

ДАЗНАННЕ, від расследавання крымінальных спраў, якое робяць упаўнаважаныя на гэта органы і службовыя асобы (міліцыя, камандзіры вайск. часцей, органы дзярж. бяспекі і інш.). Задача Д.— раскрыць і папярэдзіць злачынствы і выявіць асоб, якія іх зрабілі.

ДАЗОРАЦ Юлія Львоўна [н. 22.4(5.5).1912, г. Умань Кіеўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1967), праф. (1968). У 1938 скончыла Адэскі мед. ін-т. Працавала ў Паўд.-Асец. і Віцебскім мед. ін-тах (1942—57). З 1958 заг. кафедры шпітальнай тэрапіі Віцебскага мед. ін-та. Асн. працы па праблемах эндакрыналогіі і гепаталогіі.

Тв.: (Разам з В. Белавусавай) К вопросу о нейро-психических нарушениях при остром гепатите (болезни Боткина), «Клиническая медицина», 1950, № 10; (разам з М. С. Перліным і Л. І. Паповай) Радиоактивный иод J^{131} в лечении тиреотоксикоза, «Медицинская радиология», 1963, № 9; (у сааўт.) Пигментная и экскреторная функции печени при хронических лейкозах, «Терапевтический архив», 1970, т. 42, № 6.

ДАЗОРЦАВА Гнэся Львоўна [18(31).12.1901, мяст. Карма Магілёўскай губ.— 14.8.1966], беларускі савецкі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі. Д-р мед. н. (1945), праф. (1946). Чл. КПСС з 1939. У 1927 скончыла мед. ф-т БДУ. У акушэрска-гінекал. клініцы Мінскага мед. ін-та (1927—41, ардынатар, асістэнт, дацэнт). Адначасова была дырэктарам НДІ аховы мацярынства і дзяцінства (1931—34). Удзельніца Вял. Айч. вайны. У 1942—43 дацэнт Кіргізскага, у 1943—45 Мінскага мед. ін-таў; у 1954—58 навук. кіраўнік НДІ аховы мацярынства і дзяцінства. Асн. працы па біял. і біяхім. фактары і функцыянальную дыягностыку хвароб жаночых палавых органаў. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Биологические и биохимические защитные факторы влагалища, Мн., 1948; Функциональная диагностика в акушерстве и гинекологии на основе цитологических исследований, Мн., 1952; Гормональная терапия больных с нарушениями овариально-менструального цикла, «Здравоохранение Белоруссии», 1958, № 5.


Літ.: Г. Л. Дозорцева, «Здравоохранение Белоруссии», 1966, № 10. *Л. М. Гаршанава.* Мінск.

ДАІЛЬНАЯ ЎСТАНОЎКА, агрэгат для *даення* кароў і пачатковай апрацоўкі малака. Складаецца з некалькіх даільных апаратаў (ад 8 да 16), вакуум-помпы, эл. рухавіка і інш.



Рыс. 1

Існуюць двух- і трохтактавыя даільныя апараты. У СССР найб. пашыраны трохтактавыя (ссанне — сцісканне — адпачынак), дзеянне якіх бліжэй да прыроднага ссання малака цялём. Рабочы такт (ссанне) ажыццяўляецца перыяд. паніжэннем ціску паветра ў стаканах, якія надзяюцца на саскі. Паводле схемы размяшчэння даільных станкоў адрозніваюць Д. ў.: «Ялінка» (УДЕ-16; станкі размешчаны абапал праходу і пад вуглом да яго; гл. рыс. 1), «Карусель» (КДУ-16, КДУЕ-16; даільныя станкі на круглай пляцоўцы, якая павольна верціцца; гл. рыс. 2) і інш. Акрамя стацыянарных (тыпу пляцовак) існуюць перасоўныя Д. ў. («Малакапровод-100 Даўгава», «Малакапровод-200 Даўгава», УДС-3, УДС-8) для даення кароў у стойлах і на пашы. Д. ў. павялічваюць прадукцыйнасць працы ў 2—5 разоў, паляпрэджваюць прафес. хваробы рук даярак, забяспечваюць гігіенічнасць даення.



Рыс. 2

Літ.: Королев В. Ф. Доильные машины, 2 изд., М., 1969; Яго ж. Автоматы на молочной ферме, М., 1965.

ДАЙКА (шатл. dyke сцяна з каменю), вертыкальная або нахіленая жыла горнай пароды, абмежаваная паралельнымі плоскасцямі, якая перасякае ўмяшчальныя пароды. Утвараюцца ад застывання лавы ў шчылінах вулкана ці ад запаўнення шчылін зямной кары магмай. Гл. таксама *Заляганне горных пород*.

ДАЙЛІДКІ, вёска ў Ізабелінскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 15 *км* на У ад Астраўца, 258 *км* ад Гродна, 5 *км* ад чыг. ст. Ашмяны. 369 ж., гасп. 109 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны.

ДАЙЛІДЫ, вёска ў Іўеўскім с/с Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Новае жыццё». За 4 *км* на ПнУ ад Іўя, 156 *км* ад Гродна, 13 *км* ад чыг. станцыі Юрацішкі і Гаўя. 303 ж., гасп. 109 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.



ДАЙНЕКА Аляксандр Аляксандравіч [8(20).5.1899, Курск — 12.6.1969], рускі савецкі жывапісец і графік. Правадз. чл. АМ СССР (з 1947). Герой Сац. Працы (1969). Чл. КПСС з 1960. Нар. мастак СССР (1963). Вучыўся ў Вышэйшых маст.-тэхнічных майстэрнях (1921—24). Выразны пластычны малюнак, напружаны каларыт карцін перадаюць патхнёную працу фізічна здаровага чалавека, прыгажосць будаўніка сацыялісц. грамадства («У Данбасе», 1925; «Тэкстыльшчыцы», 1927; «Маці», 1932; «Данбас. Перапынак на абед», 1935; «Будучыя лётчыкі», 1938; «Каля мора», 1957). Падзеі рэвалюцыі і Айч. вайны адлюстраваны ў лепшых палотнах Д.— «Абарона Петраграда» (1927) і «Абарона Севастопаля» (1942—43). Дакладная будова карцін, лаканізм колеру даюць магчымасць паказаць падзеі шырока, перадаць мужнасць і гераізм абаронцаў Радзімы і рэвалюцыі. Вял. месца ў творчасці Д. займаюць манумент. жывапіс і мазаіка (пано для павільёна СССР на міжнар. выстаўцы ў Парыжы, 1937; распісваў плафоны для маск. метрапалітэна на станцыі «Маякоўская», 1938). Ленінская прэмія 1964. Імя мастака прысвоена Курскай карціннай галерэі (1970). Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Літ.: Маца И. Л., А. Дейнека, М., 1959.

ДАЙНЕКА Піліп Пятровіч [н. 16(29).11.1916, в. Дуброва Бабруйскага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Беластоцкай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сац. Працы (1966). З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1958). У Чырв. Арміі з 1937. У 1935—37 на сав. рабоце. У партызанах з жн. 1941: палітрук роты, камісар атрада; з ліст. 1943 камісар *партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага* Беластоцкай вобл. і сакратар Гродзенскага падпольнага міжрайкома КП(б)Б. З ліп. 1944 на парт. рабоце ў Гродзенскім і Мастоўскім РК КПБ. У 1965—70 першы сакратар Гродзенскага РК КПБ, з вер. 1970 заг. фін.-гасп. аддзела Гродзенскага абкома КПБ. Дэп. Вярх. Савета БССР 6—7-га скл. На XXIV з'ездзе КПБ выбіраўся канд. у чл. ЦК. Ганаровы грамадзянін г. Масты.

ДАЙНЕКІН Павел Іванавіч (18.12.1918, хутар Папаснае Багучарскага пав. Варонежскай губ.— 22.3.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў чэрв. — ліп. 1944 пры вызваленні Талачына, Барысава, Мінска. 26.6.1944 танкавая рота пад камандаваннем Д. абходным манеўрам перарэзала шашу Мінск — Масква і першая ўварвалася ў Талачын. У баях за Барысаў, Мінск і Вільнюс знішчыла 9 танкаў, 21 самаходную і 29 палявых гармат, 60 мінамётаў, 62 бронетранспарцёры, 234 аўтамашыны. Загінуў у Сопаце (Польшча). На радзіме яго імем названа школа.

ДАЙНОЎСКАЕ КНЯСТВА, удзельнае княства 13—14 ст. у Вял. кн. Літоўскім. Упамінаецца пад 1259 у грамаце Міндоўга. У 70-я г. 13 ст. ва ўладанні літ. князя Трайдэна. Займала тэр. паміж Нёманам (правыя прытокі Гаўя з р. Жыжма, Мерачанка, Дзітва) і Віліяй; па р. Котры межавала з Гродзенскім кн. Насялялі дайноўцы — нашчадкі яцвяжскага племя, асіміляванага беларусамі і літоўцамі.

Кр.: Полное собрание русских летописей, т. 17, СПб., 1907, с. 237. *М. І. Ермаловіч.* Маладзечна.

ДАКА, адм. цэнтр Усх. Пакістана. Размешчаны на пратоках агульнай дэльты Ганга і Брахмапутры. Рачны і марскі порт. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 829 тыс. ж. (1969). Вытворчасць тканін (у мінулым саматужная вытворчасць муслiну), шкла, маст. вырабаў. Джутавая, харч., палігр. прамысловасць. Ун-т (з 1925).

ДАКА́Р (Dakar), сталіца Сенегала. Размешчаны на п-ве Зялёны Мыс, самым зах. пункце Афрыкі. Вялікі марскі порт на марскіх шляхах з Еўропы ў Паўд. Афрыку і Паўд. Амерыку. Пачатковы пункт чыгунак углыб краіны. Міжнар. аэрапорт. 581 тыс. ж. (1969). Прамысловасць па перапрацоўцы арахісу (асабліва алейная і мылаварная), рыбакансервавая, мукамольная. Тытунёвая, запалкавая, баваўняная, ткацкія ф-кі. Піўзавод. Металаапр. майстэрні, вытворчасць ацэтылену і кісларoду, выбуховых рэчываў. ЦЭС. Суднаверфі. Ун-т (з 1950), НДІ па вывучэнні афрыканскіх праблем, музеі.

ДАКЕМБРЫЙ, пайстаражытнейшы этап у геал. гісторыі Зямлі і адпаведныя яму ўтварэнні зямной кары з абсалютным узростам ад 3500 млн. да 570 млн. гадоў. Папярэднічае кембрыйскаму перыяду (сістэме) палеазою, ад якога рэзка адрозніваецца адсутнасцю рэшткаў шкілетнай фаўны. Ніжняя мяжа Д. канчаткова не вызначана. У СССР Д. умоўна падзяляецца на два найбуйнейшыя адрэзкі часу — эры, а адпаведныя ім фармацыі горных парод — на вялікія надгрупы: архейскую (найстаражытнейшую) і пратэразойскую. Пратэразой у сваю чаргу падзяляецца на ніжні, сярэдні і верхні. У верхнім пратэразоі вылучаецца рыфейская група і вендскі комплекс (гл. *Геалагічнае летазлічэнне*). Больш дробных агульнапрынятых геахраналагічных і стратыграфічных падраздзяленняў Д. няма, існуюць толькі мясцовыя схемы.

Архейскія, ніжне- і сярэднепратэразойскія фармацыі складзены з розных метамарфічных парод (гнейсаў, крышталічных сланцаў, амфібалітаў, мармураў, кварцытаў), змятых у складаныя складкі і прарваных інтрузіямі рознага ўзросту і саставу (гл. *Дакембрыйскія эпохі складкавасці*). Гэтыя пароды складаюць асновы ўсіх мацерыкоў, утвараючы крышталічны фундамент дакембрыйскіх платформаў (Усходне-Еўрапейскай, Сібірскай, Афрыканскай і інш.). На паглыбленых участках платформаў (плітах) яны залягаюць пад покрывам больш маладых асадкавых парод, а на шчытах (Балтыйскі, Украінскі, Алданскі і інш.) выходзяць на зямную паверхню. Верхні пратэразой, вядомы таксама пад назвай верхні Д., ахоплівае прамежак часу каля 1 млрд. гадоў (удвая большы за ўсю

наступную геал. гісторыю Зямлі). Складзены з асадкавых (абломкавых і карбанатных) парод, у якіх трапляюцца слады арган. жыцця (адбіткі медузападобных арганізмаў, водарасцей, спораў).

З пародамі Д. звязаны шэраг каштоўных карысных выкапняў: найб. радовішчы жалеза, дзе сканцэнтравана да 80% сусв. запасаў (Курская магнітная анамалія, Крывы Рог у СССР, воз. Верхняе ў ЗША і інш.), шматлікія радовішчы марганцу (63% сусв. запасаў без сацыялісц. краін), храмітаў (73%), медзі (61%), кобальту (90%), урану (66%), вял. запасы нікелю, волата, серабра, слюдаў, магнезітаў, керамічнай і высокагліназёмістай сыравіны, алмазаў. На Беларусі ёсць перспектывы на выяўленне ў пародах Д. радовішчаў жалеза, рэдкіх элементаў і інш. Гл. таксама *Архейская эра (група), Пратэразойская эра (група), Рыфейскі эон.*

Літ.: Геология докембрия, М., 1964; Геология и перспективы металлоносности докембрия Белоруссии и смежных районов, Мн., 1965; Геохронология докембрия, М., 1970; Стратиграфия СССР. Верхний докембрий, М., 1963; Келлер Б. М. и Семихатов М. А. На заре истории Земли, М., 1966.

М. В. Вераценнікаў, У. І. Шкуратаў. Мінск.

ДАКЕМБРЫЙСКІЯ ЭПОХІ СКЛАДКАВАСЦІ, прамежкі геал. часу, калі адбываліся гораўтваральныя працэсы найстаражытнейшага этапу развіцця Зямлі.

У выніку тэктанічных рухаў геасінклінальныя тоўшчы дакембрыю зміналіся ў складкі, прарываліся асн. масай інтрузій, канчаўся геасінклінальны рэжым і адбывалася фарміраванне жорсткіх асноў (ядраў) дакембрыйскіх платформаў (гл. *Кансалідацыя*). У розных раёнах аямнога шараг больш ці менш сінхронна вылучаюцца асноўныя Д. э. с.: байкальская (позні рыфей — пачатак кембрыю), дальсландская, або грэнвільская (сярэдні рыфей), гоцкая (ранні рыфей), карэльская, або свекафенская (ранні і сярэдні пратэразой) і самая старажытная — беламорская (у археі). Найб. вывучана *байкальская складкавасць*.

Літ.: Богданов А. А. Тектонические эпохи (к вопросу о периодизации тектонической истории Земли), «Бюллетень Московского общества испытателей природы. Отд. геологический», 1969, т. 44, в. 5. *М. В. Вераценнікаў, У. І. Шкуратаў.* Мінск.

ДАКОЛЬ, вёска ў Клятнянскім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Гвардыя». За 18 *км* на ПдЗ ад Глуска, 188 *км* ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Старыя Дарогі. 372 ж., дваroў 129 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі.

ДАКОЛЬКА (Даколь), рака, правы прыток Пцічы (бас. Прыпяці). Даўж. 59 *км*. Цячэ ў Глускім р-не Магілёўскай вобл. Вадазбор (462 *км*²) слаба перасечаны, дробнаўзгорысты, значна забалочаны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2,3 *м*³/*сек*.

ДАКТУРОЎСКІ Уладзімір Сямёнавіч [6(18).11.1884, г. Мікалаеў — 20.3.1935], савецкі балотазнавец і палеабатанік. У 1907 скончыў Маск. ун-т. З 1908 працаваў у Пецярбургскім бат. садзе, з 1912 у дэпартаменце земляробства. З 1918 на навук. і пед. рабоце ў Маскве. У 1934 выкладаў курс балота- і торфазнаўства ў БДУ. Распрацаваў метад вывучэння сувязі паміж раслінным покрывам, водным рэжымам, геал. будовай балот і хім. саставам торфу. Увёў у практыку метад пылковага аналізу торфу. Вывучаў балоты Беларусі, Еўрап. часткі РСФСР, Закаўказзя, Сібіры. За працы па балотазнаўстве ўдастоены залатога медаля Рас. геагр. т-ва (1924).

Тв.: Торфяныя балоты, іх утварэнне і развіццё, Мн., 1930.

Літ.: (В. С. Доктуровский), «Почвоведение», 1936, № 2.

ДАКТЫЛАЛО́ГІЯ (ад грэч. dáktylos палец+ +*...логія*), ручная азбука глуханямых. Грунтуецца на знаках, якія ўтвараюцца пальцамі рук: кожнай літары адпавядае пэўная канфігурацыя пальцаў. Той, хто гаворыць, мяняе фігуры з пальцаў, а той, хто ўспрымае, складае з іх словы. Мовы з рознымі алфавітамі маюць кожная сваю дактылалагічную сістэму. На Беларусі пашырана рус. Д.

ДАКТЫЛАСКАПІЯ (грэч. dáktylos палец+ +skopeō гляджу), раздзел крыміналістыкі, які вывучае спосабы выяўлення асобы па ўзорах далоневай паверхні канцавых фалангаў пальцаў рук. У кожнага чалавека папілярныя лініі ўтвараюць індывідуальны ўзор; які адносна не мяняецца ўсё жыццё, нават пасля паверхневых пашкоджанняў скуры.

У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, адбіткі пальцаў на спец. бланках (дактакартах) кадзіруюцца па прынятай схеме, ставяцца ў картатэку. На патрабаванні органаў следства і суда выяўленыя на месцы злачынства сляды рук параўноўваюцца з адбіткамі пальцаў падазронага (дактыласкапічная экспертыза), і на аснове гэтага робіцца вывад, ці мае гэтая асоба дачыненне да злачынства. *А. В. Дулаў.* Мінск.

ДАКТЫЛЬ (грэч. dáktylos палец), у сілабатанічным вершаскладанні трохскладовая стапа з націскам на першым складзе (– ◡ ◡). Напр.: «Ночь надыходзіць, і хмары ўстаюць, лозы размову трывожна вядуць» (Я. Колас. «Будзе навальніца»). Д. сустракаем у вершах Я. Купалы («Беларусі ардэнаноснай»), у паэмах А. Куляшова («Грозная пушча»), У. Дубоўкі («Крычаўская спакуса», «Кругі») і інш.

ДАКУДАВА, вёска ў Нацкім с/с Крупскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 20 *км* на З ад Крупак, 98 *км* ад Мінска, 9 *км* ад чыг. ст. Прыяміна. 331 ж., гасп. 102 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1944 ням.-фаш. захопнікі спалілі Д. Помнік адпавяскоўцам, якіх загубілі ням.-фаш. захопнікі.

ДАКУДАВА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе Нёмана. Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 32 *км* на ПдУ ад Ліды, 146 *км* ад Гродна, на шашы в. Мінойты — в. Ліпнішкі. 375 ж., гасп. 153 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле 130 сав. воінаў, партызанаў, адпавяскоўцаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО, від кінамастацтва, заснаванага на здымках сапраўдных жыццёвых падзей, з'яў, фактаў. Складаецца з кінахронікі (кіначасопіс) і вобразнай публіцыстыкі (дакумент. фільм).

У сак. 1917 створаны аддзелы кінахронікі ў Маскве і Петраградзе, зняты падзеі Кастр. рэвалюцыі. Развіццё сав. Д. к. звязана з пошукамі рэжысёраў Дз. *Вертава* («Кінапраўда», 1922—25; «Чалавек з кінаапаратам», 1929, і інш.), Э. Шуб («Падзенне дынастыі Раманавых», 1927), У. Ерафеева [«Дах свету» («Памір»), 1928], У. Шнейдэрава (серыя «Падарожжа па СССР»), Р. *Кармэна* («Суд народаў», 1947; «Вялікая Айчынная», 1965), аператараў Р. Гібера, Э. *Ціса*, А. Лявіцкага і інш. На Беларусі ў 1925 выйшлі першыя кінавыпускі («VII з'езд Саветаў» і інш.) і дакумент. фільм «У здаровым

целе — здаровы дух» аператара М. Лявонцьева. У 1931 створаны сектар кінахронікі (узначальваў Б. Небыліцкі), пачаўся рэгулярны выпуск кіначасопісаў (гл. *Кіначасопіс*). У 1935 арганізавана Мінская студыя кінахронікі. Выйшлі фільмы: «Такая наша Беларусь» (1927, рэж. Я. Пятроў), «Калгас» (1928, А. Машковіч), «На ўздыме» (1931, Л. Эпельбаўм), «Чырвоны дазор» (1937, У. Шмітгоф і М. Гаўронскі) і інш. У Вял. Айч. вайну кінадакументалісты стварылі летапіс партыз. барацьбы ў рэспубліцы, франтавыя кінавыпускі. Зняты фільм «Вызваленне Савецкай Беларусі» (1944, рэж. У. Корш-Саблін). У пасляваен. час пераважалі аглядавыя фільмы пра рэспубліку («Савецкая Беларусь», 1948, рэж. Л. Голуб; 1952, Корш-Саблін і І. Краўчуноўскі; і інш.), створаны нарысы «Суд народа» (1946, Ю. Стальмакоў), «Навасёлле» (1947, І. Вейняровіч), «Слуга народа» (1950, І. Шульман) і інш. У 1961 арганізавана Мінская студыя навук.-папулярных і хранікальна-дакумент. фільмаў. Д. к. канца 50-х і у 60-я г. вызначаецца дакумент. дакладнасцю, пошукамі новых сродкаў выразнасці. Найб. значныя фільмы: «Праўда пра сектантаўпяцідзесяцітнікаў» (1958, У. Стральцоў), «Цытадэль славы» (1960, М. Гарбуноў), «Дачка партыі» (1961, В. Сукманаў), «Людзі з чорнымі душамі» (1961, П. Шамшур), «Паэт у дарозе» (1964, С. Прошын), «Арліная крыніца» (1966, Сукманаў), «Шчырая размова» (1966, М. Хубаў), «Генерал Пушча» (1967) і «У агні жыцця» (1969, абодва рэж. Вейняровіча), «Пакараны смерцю у 41-м» (1967, В. Чацверыкоў), «Штрыхі да партрэта» (1968, рэж. І. Пікман, У. Цяслюк і Р. Ясінскі), «Боль мой — Хатынь» (1969, П. Аліфярэнка). Спіс фільмаў гл. да артыкула *Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў*.

Літ.: Документальное кино сегодня, М., 1963; Дробашенко С. В. Экран и жизнь, М., 1962; Ежегодник кино, М., 1956—63; История белорусского кино, ч. 1—2, Мн., 1969—70; Бондарева Е. и Шилова Л. Очерк на экране, Мн., 1969.

Г. В. Ратнікаў. Мінск.

ДАКУЧАЕЎ Васіль Васілевіч [17.2(1.3).1846, с. Мілюкова Сычоўскага пав. Смаленскай губ.— 26.10(8.11).1903], рускі вучоны-прыродазнавец, заснавальнік навуковага глебазнаўства. Скончыў фізіка-матэм. ф-т Пецярбургскага ун-та (1872). У 1879 выкладаў у ім першы ў гісторыі сусв. навукі курс чацвярцічнай геалогіі, з 1880 — курс мінералогіі і крышталаграфіі. Арганізатар і кіраўнік экспедыцый па вывучэнні глебаў Расіі. У працы «Рускі чарназём» (1883), напісанай як доктарская дысертацыя, сфармуляваў асн. палажэнні сучаснага навук. глебазнаўства. Даў першую навук. класіфікацыю глебаў, заснаваную на генетычным прынцыпе (1886). Распрацаваў метады картаграфавання глебаў і склаў першую глебавую карту паўн. паўшар'я. Вывучаў прычыны засухі ў стэпавых р-нах краіны і распрацаваў мерапрыемствы па пераўтварэнні прыроды стэпу. Стварыў вучэнне пра геагр. зоны. У 1892—97 дырэктар Нова-Аляксандрыйскага ін-та с.-гасп. і лесаводства, дзе заснаваў кафедру глебазнаўства. У 1899 па ініцыятыве Д. напрысвоена Глебаваму ін-ту і Цэнтр. музею глебазнаўства УАСГНІЛ. У 1946 установлены залаты медаль і прэмія імя Дакучаева.



Тв.: Соч., т. 1—9, М.— Л., 1949—61 (бібліягр.).

Літ.: В. В. Докучаев и география. 1846—1946. К столетию со дня рождения, М., 1946 (бібліягр.); Полынов Б. Б., В. В. Докучаев и естествознание, у кн.: Труды юбилейной сессии, посвященной столетию со дня рождения В. В. Докучаева, М.— Л., 1949; Рагавой П. П., В. В. Дакучаеў, Мн., 1951.

ДАКУЧАЕЎ Мікалай Ягоравіч (н. 24.12.1918, в. Заполле Каргапальскага пав. Алонецкай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941 у матарызаваным пантонна-маставым батальёне. Вызначыўся ў вер. 1943 у Камарынскім р-не Палескай вобл. ў баях за Дняпро. Умела маневраваў на пантоне пад агнём ворага, пераправіў на правы бераг групу сав. воінаў, якія захапілі плацдарм. Жыве ў Маскве.

ДАКУЧАЕЎ Міхаіл Паўлавіч (н. 14.9.1921, г. Дарагабуж Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся 25—30.6.1944 пры вызваленні Магілёўскай вобл. Батальён, якім камандаваў Д., у наступальных баях на З ад Чавусаў прычыніў ворагу вялікія страты, фарсіраваў Расту, захапіў замініраваны мост цераз Дняпро каля в. Дашкаўка. Удзельнік вызвалення Мінска. Жыве ў Маскве.

ДАЛАДЗЬЕ (Daladier) Эдуард (18.6.1884, Карпантра — 11.10.1970), французскі паліт. і дзярж. дзеяч. Доўгі час быў адным з лідэраў партыі радыкалаў, яе старшынёй у 1927—31, 1935—38, 1957—58. У 1924—40 няраз уваходзіў у склад урада. Прэм'ер-міністр у студз.—кастр. 1933, студз.— лют. 1934, крас. 1938— сак. 1940. Удзельнічаў у Нар. фронце, але ў кастр. 1938 кіраўніцтва радыкалаў на чале з Д. раскалола Народны фронт, і ўрад Д. ліквідаваў шэраг яго заваёў. Ажыццяўляў палітыку «ўціхамірвання» фаш. агрэсараў. Падпісаў *Мюнхенскае пагадненне 1938*. Пасля капітуляцыі Францыі летам 1940 арыштаваны ўрадам «*Вішы*», у 1943 вывезены гітлераўцамі з Францыі і інтэрніраваны ў Аўстрыі. Вызвалены ў 1945. У 1947—54 узначальваў «Аб'яднанне левых рэспубліканцаў». Выступаў супраць калан. вайны Францыі ў Індакітаі (1946—54), супраць планаў стварэння Еўрапейскага абарончага супольніцтва. Пасля 1958 адышоў ад паліт. жыцця.

Д'АЛАМБЕР (D'Alembert) Жан Лерон (16.11.1717, Парыж — 29.10.1783), французскі філосаф-асветнік і матэматык. Разам з Д. Дзідро стварыў «Энцыклапедыю». Ва ўступным артыкуле да яе «Нарыс паходжання і развіцця навук» (1751) зрабіў спробу апісаць гісторыю ўзнікнення і развіцця чалавечага пазнання і даў класіфікацыю навук. У 1757 з-за праследаванняў рэакцыі адышоў ад выдання «Энцыклапедыі». Як філосаф стаяў на пазіцыях *дуалізму*. Лічыў, што існуюць нязменныя маральныя прынцыпы, якія не залежаць ад грамадскага асяроддзя. Абараняў бурж. ўласнасць і выступаў супраць феад. уласнасці як несправядлівага размеркавання багацця ў паміж людзьмі. Непаслядоўныя погляды Д'А. па пытаннях тэорыі пазнання і рэлігіі

крытыкаваў Дзідро ў творах «Сон Д'Аламбера», «Размова Д'Аламбера з Дзідро» і інш. У галіне аналітычнай механікі Д'А. сфармуляваў агульныя правілы складання дыферэнцыяльных ураўненняў руху матэрыяльных сістэм — т. зв. прынцып Д'А. (гл. *Варыяцыйныя прынцыпы механікі*). Аўтар прац па тэорыі музыкі і муз. эстэтыцы.

Тв.: Рус. пер.— Динамика. Трактат, ..., М.— Л., 1950.

ДАЛАМІТ (ад імя франц. геолага Д. Далам'ё), мінерал класа карбанатаў $CaMg(CO_3)_2$. Крышталі трыганальнай сістэмы, добра агранеяя, ромбаэдрычнага выгляду. Колер шаравата-белы з рознымі адценнямі. Бляск шкляны. Цв. 3,5—4; шчыльн. 2800—2900 *кг/м*³. Крохкі. Вельмі пашыраны пародаўтваральны мінерал асадкавых горных парод (першаснага асадкавага паходжання і вынік другаснай даламітызацыі парод), радзей гідратэрмальнага паходжання. Даламітам наз. і асадкавую горную пароду з амаль монамінеральных скопішчаў гэтага мінералу. Найб. масы Д. ўтварыліся ў пратэразоі і ў палеазоі. Радовішчы на Урале, у Данбасе, Паволжы. На Беларусі пераважна ў Віцебскай вобл. (Руба, Гралева і інш.).

Ужываецца як будаўнічы камень, ідзе на выраб вогнеўкіх і тэрмаізаляцыйных (з азбестам) рэчываў, вогнетрывалы матэрыял і флюс у металургіі. Выкарыстоўваецца ў хім., шкляной і інш. галінах прамысл., у с. гасп. (для вапнавання кіслых глебаў).

Літ.: Швецов М. С. Петрография осадочных пород, 3 изд., М., 1958; Томашевич А. В., Куркина З. А. и Грушецкий В. М. Минерально-сырьевая база промышленности строительных материалов БССР (Геолого-экономическая оценка), Мн., 1968.

ДАЛАС (Dallas), горад на Пд ЗША ў штаце Тэхас. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Аэрапорт. 1459 тыс. ж. (1968). Цэнтр нафтагазавай прамысловасці Пд ЗША. Харч., лёгкая (пераважна швейная) прамысловасць. Самалётабудаванне, аўтазборка, вытворчасць абсталявання для нафтавай прамысл., с.-г. машынабудаванне. Гандаль бавоўнай. У Д. забіты прэзідэнт ЗША Дж. Ф. Кенэдзі 22.11.1963.

ДАЛГАПЛОСК Барыс Аляксандравіч [н. 30.10(12.11).1905, мяст. Лукомль Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], савецкі хімік. Акад. АН СССР (1964, чл.-кар. 1958). Чл. КПСС з 1945. Герой Сац. Працы (1963). З 1963 заг. лабараторыі ў Ін-це нафтахім. сінтэзу імя А. В. Топчыева АН СССР. Навук. працы ў галіне хіміі высокамалекулярных злучэнняў: адкрыццё і вывучэнне акісляльна - аднаўленчага ініцыравання радыкальных працэсаў, сінтэз эмульсійных каўчукаў; вывучэнне стэрэаспецыфічнай палімерызацыі дыенаў і сінтэз стэрэарэгулярных каўчукаў; адкрыццё і вывучэнне стэрэаспецыфічнага каталізу ў працэсе палімерызацыі, вывучэнне механізму радыкальных і іонных працэсаў. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі. Дзярж. прэміі СССР 1941 і 1949.



Тв.: (У сааўт.) Полимеризация диенов под влиянием л-аллильных комплексов, М., 1968.

Літ.: Борис Александрович Долгоплоск (К 60-летию со дня рождения и 34-летию научной деятельности), «Высокомолекулярные соединения», 1966, т. 8, № 2.

ДАЛГАПОЛАЎ Васіль Іванавіч (1906, Іркуцк — крас. 1953), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. У ноч на 27.6.1944 старшы сяржант Д. з групай байцоў разведвальнай роты пераправіўся цераз раку і захапіў плацдарм.

ДАЛГОЎ Іван Іванавіч [1857, Пецярбургская губ.— 5(18).10.1911], беларускі гісторык, археолаг, краязнавец. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1880). З 1889 у Полацкім кадэцкім корпусе. Вывучаў гісторыю Полацка, раскопваў курганы на Полаччыне. Адзін з арганізатараў музея Полацкага кадэцкага корпуса. Аўтар прац па гісторыі Полаччыны і Кадэцкага корпуса.

Тв.: Прошлое и настоящее Белоруссии, «Витебские губернские ведомости», 1897, № 19; Наш край, там жа, 1898, № 113—114; Полоцкий кадетский корпус, Витебск, 1899.

Літ.: Леонардов Д. Памяти действительного члена Витебской ученой архивной комиссии Ивана Ивановича Долгова, у зб.: Полоцко-Витебская старина, кн. 1, ч. 2, Витебск, 1911, с. 1—11.

ДАЛГОЎ Рыгор Апанасавіч (1903, в. Старая Брынь Казельскага пав. Калужскай губ.— 24.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся на тэр. Віцебскай вобл. 22.6.1944 на чале ўзвода прарваў абарону праціўніка каля Сіроціна і захапіў варожыя траншэі, 24.6.1944 фарсіраваў Зах. Дзвіну. Загінуў у баі за плацдарм.

ДАЛГОЎ Уладзімір Канстанцінавіч [15(28).3.1916, г. Волагда — 24.6.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1941. Вызначыўся на тэр. Віцебскай вобл. 23.6.1944 узвод пад камандаваннем лейтэнанта Д. выбіў ворага з траншэй каля г. п. Шуміліна, 24.6.1944 першы фарсіраваў Зах. Дзвіну, замацаваўся на плацдарме, адбіў атаку. Загінуў пры вызваленні в. Буй каля Бешанковіч.

ДАЛЕНГА-ХАДАКОЎСКІ Зарыян Якаўлевіч (сапр. Чарноцкі Адам; 4.4.1784 — 17.11.1825), славянаназнавец, пачынальнік беларускай, польскай, рускай і ўкраінскай археалогіі, фальклярыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Чл.-кар. варшаўскага «Т-ва сяброў навук» (1819), пецярбургскага «Вольнага т-ва аматараў расійскай славеснасці» (1819), маскоўскага «Т-ва гісторыі старажытнасцей расійскіх» (1820). Н. каля в. Гайна (Мінская губ.) у сям'і беззямельнага шляхціца. Скончыў Слуцкае пав. вуч. (1800). Працаваў у Мінску прыватным адвакатам. У архівах Мінска вывучаў стараж. бел. акты і граматы. З 1807 аканом маёнтка графа Несялоўскага ў Варончы каля Навагрудка. У 1814—18 працаваў у б-цы Крамянецкага ліцэя і ў б-цы апекуна Віленскай навуч. акругі А. Чартарыйскага (маёнткі ў

Шклоўскі і Слонімскі)». Шырокавядомы ў Малой Айчыннай, Галіцыі, Шлезвігу. 14.12.1813 атрымаў ад Віленскага ун-та *ступень магістра* за працу рэцэнзіі. На Беларусі даследаваў старажытныя ў Шклоўшчыне, Віцебшчыне, Тураве, Бабруйскім пав., каля Ерасіна, Гомеля, Мінскім, в. Слабое Сяло Віцебскага пав. і інш., рабіў запісы фальклору, жыццяпісаў дзеячаў, абследаў. У 1820—21 збіраў і вывучаў археал., дыялектал., этнагр. і фальклорныя матэрыялы на рус. Поўначы. Найб. значная праца «Пра славянскую да хрысціянства» (1818), у якой упершыню зроблена спроба даць малюнак старажыт. слав. быту, культуры і нар. творчасці ў дахрысціянскі перыяд, намечана праграма комплексных даследаванняў слав. і суседніх народаў. У «Даследаваннях адносна рускай гісторыі» (1819) крытыкаваў некат. палажэнні «Гісторыі дзяржавы Расійскай» М. Карамзіна, удакладніў факты, звязаныя з тэр. Беларусі (у наст. выданнях Карамзін улічыў іх). У «Праекце вучонага падарожжа па Расіі для вытлумачэння старажытнай славянскай гісторыі» (1820) і «Гістарычнай сістэме Хадакоўскага» (апубл. 1838) Д.-Х. абгрунтаваў археал. тэорыю гарадзішчаў, прынцыпы збору фальклору і дыялектнай лексікі; упершыню ў славістыцы паказана роля тапанімікі для гістар. даследаванняў, даецца рэестр агульнаслав. тапонімаў (у т. л. беларускіх), вызначана тэр. пашырэння бел. мовы. Большасць прац Д.-Х. неапубл.: збор бел. (каля 500), укр., польскіх і рус. песень, запісы замоў, загадак, слоўнікі, матэрыялы па слав. этнаграфіі, дыялекталогіі, тапаніміцы, археалогіі. Меў значны ўплыў на фалькл. дзейнасць Т. Зана, Яна Чачота, А. Адынца, А. Ходзькі, П. Кіраеўскага, М. Максімовіча і інш. Навук. і збіральніцкая дзейнасць Д.-Х. была ўзорам і праграмай для шэрагу навукова-літ. аб'яднанняў Беларусі, Украіны, Польшчы і Расіі. Многія славянаznаўчыя праблемы (слав. этнагенез, прарадзіма славян), вылучаныя Д.-Х., актуальныя і ў наш час.

Тв.: Пути сообщения в древней России, «Русский исторический сборник», 1837, т. 1, кн. 1; Донесение о первых успехах путешествия в России Зорияна Долуга-Ходаковского, из Москвы 13 липца 1822, там жа, 1844, т. 7; Путевые записки Ходаковского, «Журнал Министерства народного просвещения», 1838, ч. 20, № 12; O Słowiańszczyźnie przed chrześcijaństwem oraz inne pisma i listy, Warszawa, 1967.

Літ.: Малаш-Аксамитова Л. А. Доленга-Ходаковский (Адам Чарноцкий) и его наследие, Lud, [t.] 51, za rok 1966, cz. 1, Wrocław, 1967; Maślanka J. Zorian Dołęga Chodakowski, Wrocław — Warszawa — Kraków, 1965.

Л. А. Малаш-Аксамітава. Мінск.

ДАЛЕС (Dulles) Джон Фостэр (25.2.1888, Вашынгтон — 24.5.1959), дзярж. дзеяч ЗША. Па прафесіі юрыст. Належаў да Рэсп. партыі. Быў цесна звязаны з фін. алігархіяй ЗША. Пасля 2-й сусв. вайны адзін з актыўных арганізатараў Паўночнаатлантычнага і інш. агрэс. блокаў. У 1950—52 саветнік дзярж. дэпартамента, у 1953—59 дзярж. сакратар ЗША. Натхняльнік палітыкі «з пазіцыі сілы», «халоднай вайны» і «балансавання на мяжы вайны».

Літ.: Очерки новой и новейшей истории США, т. 2, М., 1960.

ДАЛЕЎСКАЯ Аляксандра Дамінікаўна ((1821, фальв. Кункулка Лідскага пав. Віленскай губ.— пасля 1913)), удзельніца нацыянальна-вызв. руху 1863—64, жонка З. *Сераковскага*. З дробнай шляхты. Шасці рангоўму выхаванню сыскана ў Еўтэрпэ. З 1867 у Варшаве вяла прыватную і літаратурную дзейнасць. Аўтар успамінаў пра паўстанне, рукапіс якіх зберагаецца ў ЦДГА Літоўскай ССР.

Літ.: Merkys V. Dalevičių šeima, Vilnius, 1967; Бакунич В. Е. Воспоминания А. Сераковской (Далевской) и другие материалы о З. Сераковском в ЦГИА Литовской ССР, у кн.: К столетию героической борьбы «за нашу и вашу свободу», М., 1964; За нашу и вашу свободу. Герои 1863 года. М., 1964.

ДАЛЕЎСКІ Аляксандр Дамінікавіч (24.1.1827, фальв. Кункулка Лідскага пав. Віленскай губ.— 25.4.1862), удзельнік нацыян. руху ў Беларусі і ў Літве. З дробнай шляхты. У час навучання ў Віленскай гімназіі (1838—46) з братам Францішкам стварыў падпольную рэвалюц. арг-цыю *Братні саюз літоўскай моладзі*, у 1849 арыштаваны, каля 10 гадоў праседзеў у турме, прабыў на катарзе і ў сібірскай ссылцы. З 1858 у Вільні.

Літ.: Гл. пры арт. *Далеўская*.

ДАЛЕЎСКІ Канстанцін Дамінікавіч (1837, фальв. Кункулка Лідскага пав. Віленскай губ.— 27.5.1871), удзельнік паўстання 1863—64. З дробнай шляхты. Вучыўся ў Віленскай гімназіі і Маскоўскім ун-це. З 1862 каморнік у Ковенскім пав. Актыўна ўдзельнічаў у паўстанні 1863 на Ковеншчыне, пейкі час камандаваў асобным атрадам, паранены. Пасля разгрому паўстання ў эміграцыі. У час Парыжскай камуны 1871 расстраляны версальцамі.

Літ.: Гл. пры арт. *Далеўская*.

ДАЛЕЎСКІ Францішак Дамінікавіч (1825, Руднікі Лідскага пав. Віленскай губ.— 24.4.1904), удзельнік вызв. руху на Беларусі і ў Літве і паўстання 1863—64. З дробнай шляхты. У час навучання ў Віленскай гімназіі з братам Аляксандрам у 1846 стварыў падпольную рэвалюц. арг-цыю *Братні саюз літоўскай моладзі*. Арыштаваны і ў 1850 засуджаны на 15 гадоў катаргі. Вярнуўшыся з Сібіры ў Вільню (1860), далучыўся да ліберальна-ўмеранага крыла вызв. руху. У час паўстання 1863 адзін з кіраўнікоў партыі *«белых»*, чл. паўстанцкага *Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы*. У чэрв. 1863 арыштаваны і засуджаны на 20 гадоў катаргі. З 1883 у Варшаве.

Літ.: Гл. пры арт. *Далеўская*.

ДАЛЕЎСКІ Цітус Дамінікавіч (13.5.1840, фальв. Кункулка Лідскага пав. Віленскай губ.— 11.1.1864), удзельнік паўстання 1863—64. З дробнай шляхты. У час навучання ў Маскоўскім і Пецярбургскім ун-тах удзельнічаў у студэнцкім руху, у рабоце польскіх, бел. і літ. зямляцтваў. У пач. 1863 вёў рэвалюц. работу ў Маскве, меў дачыненне да т. зв. казанскай змовы. З крас. 1863 у Вільні, найбліжэйшы памочнік К. Каліноўскага па кіраўніцтве паўстаннем. 8(20).12.1863 арыштаваны, расстраляны на Лукішскай плошчы ў Вільні.

Літ.: Гл. пры арт. *Далеўская*.

ДАЛЕЦКІ (Фенігштэйн) Якаў Генрыхавіч (22.2.1888, Варшава — 19.6.1937), рэвалюцыянер, савецкі парт. дзеяч. Чл. КПСС з 1904. Чл. Варшаўскага і Ломжынскага к-таў, сакратар Бюро ЦК СДКПіЛ (1910). Удзельнік Брусельскай канферэнцыі II Інтэрнацыянала (1914). У 1916 чл. к-та РСДРП у Саратаве. Пасля Лют. рэв. чл. Саратаўскага Савета, потым Петраградскага к-та РСДРП(б) і яго Ваеннай камісіі. На II Усерас. з'ездзе Саветаў абраны чл. ВЦВК. З канца 1918 у Мінску і Вільні — нарком унутр. спраў, нам. старшыні Саўнаркома ССР Літвы і Беларусі, чл. ЦК і Прэзідыума ЦК КП(б)ЛіБ, чл. РВС Зах. страдк. дывізіі, прадстаўнік ЦК РКП(б) пры палітадэле Зах. фронту. Выкладчык курсаў чырв. камандзіраў у Мінску. З 1921 чл. Галоўпалітасветы і адказны кіраўнік РОСТА, з 1925 — ТАСС. Адначасова з 1929 старшыня радкалегіі польск. выдавецтва Інстытута Маркса — Энгельса — Леніна.

ДАЛЕКАЛЕТНАЯ АВІЯЦЫЯ, від ваеннай авіяцыі, прызначанай для паражэння з паветра важных аб'ектаў праціўніка. У час ваен. дзеянняў можа праводзіць самастойныя паветр. аперацыі з ужываннем ядз. і звычайнай зброі з мэтай знішчыць ракетныя групоўкі, разбурыць ваенна-прамысл. аб'екты і энерг. збудаванні, цэнтры і пункты дзярж. і ваен. кіравання; памагае сухап. войскам і ВМФ праводзіць баявыя аперацыі.

На ўзбраенні Д. а. самалёты (бамбардзіроўшчыкі і ракетаносцы), якія маюць вял. скорасць і далёкасць палёту, могуць несці ядзерныя бомбы магутнасцю да некалькіх мегатон. Каб павялічыць радыус дзеяння Д. а., пры неабходнасці самалёты дазапраўляюць гаручым непасрадна ў паветры спецыяльна абсталяванымі самалётамі-палівазапраўшчыкамі.

ДАЛЁКАЎСХО́ДНІ УНІВЕРСІТЭ́Т, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1923 ва Уладзівастоку. У 1939 закрыты, адноўлены ў 1956 на базе Уладзівастоцкага пед. ін-та. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: філал., усх., гісторыка-прававы, фізіка-матэматычны, геафізічны, хімічны, біёлага-глебавы. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае; ёсць аспірантура. Выдае «Вучоныя запіскі» (з 1957).

ДАЛЁКАЎСХО́ДНЯЯ РЭСПУБЛІ́КА, часовае дзярж. ўтварэнне ва Усх. Сібіры і на Далёкім Усходзе ў 1920—22; дэмакр. рэспубліка, кіруючая роля ў якой належала рабочаму класу на чале з Камуністычнай партыяй. Створана паводле рашэння ЦК РКП(б) як буферная дзяржава, каб пазбегнуць ваен. канфлікту РСФСР з Японіяй і ліквідаваць інтэрвенцыю мірным шляхам. Абвешчана 6.4.1920 на Устаноўчым з'ездзе працоўных Прыбайкалля ў Верхнеўдзінску (Улан-Удэ). У склад Д. р. ўвайшлі Забайкальская, Амурская, Прыморская, Камчацкая вобл., Паўн. Сахалін (пл. больш за 1,5 млн. км², нас. больш за 1,8 млн. чал., сталіца Верхнеўдзінск, з 10.11.1920 — Чыта). Сав. ўрад 14.5.1920 прызнаў Д. р. Устаноўчы сход рэспублікі 12.2—27.4.1921 прыняў дэмакр. канстытуцыю, выбраў урад. У маі 1921 контррэвалюцыя пры падтрымцы японцаў захапіла ўладу ва Уладзівастоку, у снеж.— у Хабараўску. Армія Д. р. на чале з В. К. *Блюхерам* 14.2.1922 вызваліла Хабараўск, 25.10.1922 — Уладзівасток. Японія эвакуіравала свае войскі. Па хадайніцтве Нар. сходу Д. р. ВЦВК 15.11.1922 прыняў дэкрэт пра ўключэнне яе ў склад РСФСР.

Літ.: Авдеева Н. А. Дальневосточная народная республика (1920—1922 гг.), Хабаровск, 1957; Шишкин С. Н. Гражданская война на Дальнем Востоке. 1918—1922 гг., М., 1967.

ДАЛЁКАЯ СУВЯЗЬ, перадача і прыём інфармацыі на вялікія адлегласці. Падзяляецца на праводную і радыёсувязь. Апошняя падзяляецца на праводных шматразовых (шматкодных) кабельных і радыёрэлейных ліній (РРЛ), а таксама на радыё.




Схема далёкай радыёсувязі з выкарыстаннем спадарожніка «Маланка-1».

Кабельныя магістралі Д. с. перасякаюць Еўрап. частку СССР, Урал, Сібір, Д. Усход, Сярэднюю Азію, Закаўказзе. Будуецца адзіная аўтаматызаваная сетка сувязі, якая аб'яднае ўсе тэхн. сродкі сувязі краіны і будзе перадаваць усе віды інфармацыі. РРЛ забяспечваюць сувязь у дыяпазоне ультракаротkіх (дм, см) хваляў. Звычайна працуюць дзве канцавыя і некалькі прамежкавых станцый (рэтранслятараў), адлегласць паміж імі залежыць ад рэльефу мясцовасці і не перавышае 50—70 км. РРЛ разам з кабельнымі лініямі забяспечваюць міжгароднюю магістральную сувязь, абмен тэлевізійнымі праграмамі паміж рознымі тэлецэнтрамі краіны і сеткай Інтэрбачання. Пры ўстаноўцы рэтранслятара на штучным спадарожніку Зямлі (ШСЗ) РРЛ забяспечвае сувязь паміж наземнымі пунктамі на адлегласці да некалькіх тысяч км. У СССР ШСЗ *«Маланка»* выкарыстоўваюцца для тэлевізійнай і шматканальнай тэлеф., тэлегр. і фотатэлеграфнай сувязі паміж Масквою і Уладзівастокам (гл. рыс.). Савецкая сістэма «Маланка» з наземнымі станцыямі «Арбіта» забяспечвае сувязь паміж гарадамі СССР і інш. краінамі.

Літ.: Куликов В. В. Современные системы беспроводной дальней связи, М., 1968; Калашников Н. И. Системы связи через искусственные спутники Земли, М., 1969. *Р. Р. Хадасевіч.* Мінск.

ДАЛЕКІЯ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Праўда». За 27 км на ПдЗ ад Браслава, 276 км ад Віцебска, 51 км ад чыг. ст. Гадуцішкі. 509 ж., гасп. 181 (1971). Швейная і шавецкая майстэрні, млын. Сярэдняя школа, клуб, бальніца, антэка, вет. пункт, магазін.

ДАЛЕКІЯ, вёска ў Мыцкім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Камунар». За 8 км на ПдЗ ад Ліды, 110 км ад Гродна. 180 ж., гасп. 64 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 5 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



ДАЛІВА - ДАБРАВО́ЛЬСКІ Міхаіл Восіпавіч [2(14).1.1862, Пецярбург — 15.11.1919], рускі электратэхнік, стваральнік тэхнікі трохфазнага электрычнага току. Упершыню ў 1891 здзейсніў перадачу эл. энергіі трохфазнага пераменнага току на адлегласць. Вынайшаў трох-

фазны асінхронны рухавік. Сканструяваў многія эл. машыны і апараты (трохфазны трансфарматар, фазометр, дзельнік напружання, пускавыя рэастаты і інш.).

Тв.: Избр. труды (о трехфазном токе), М.— Л., 1948.

Літ.: Веселовский О. Н. Доливо-Добровольский, М., 1963.

ДАЛІДОВІЧ Аляксандр Іванавіч [2(15).2.1905, в. Заўшыцы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 10.3.1946], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1929. Скончыў Вышэйшую камуніст. с.-г. школу ў Мінску (1935). У Чырв. Арміі з 1927. Перад вайною на сав. рабоце. У партызанах з ліп. 1941. З студз. 1943 камандзір *партызанскай брыгады № 25* імя П. К. Панамарэнкі Мінскай вобл., адначасова ў складзе Любанскага падпольнага РК КП(б)Б. З вер. 1944 да жн. 1945 у СНК БССР. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ДАЛІНЫ, паглыбленні на паверхні Зямлі лінейна-выцягнутай формы з ухілам ад вярхоўя да вусця, утвораныя пераважна ад дзейнасці цякучай вады. У добра развітых аформленых рачных Д. выдзяляюць: рэчышча — найб. нізкую частку Д., занятую вадой; пойму — плоскае дно, звычайна ўкрытае раслінасцю і залітае вадой у час паводкі, з мноствам лагун і старыц (адшнураваных выгінаў ракі на месцы старога рэчышча); тэрасы — гарызантальныя або слаба нахіленыя пляцоўкі на розных узроўнях над зрэзам вады; схілы або барты выпуклай, увагнутай, прыступкавай, прасталінейнай і інш. формаў, якія часам паз. «карэннымі» берагамі Д. Часам да тэрас адносяць і пойму (поймавая тэраса). Тэрасы, размешчаныя вышэй поймы, паз. надпоймавымі і ўлік іх ідзе ад рэчышча (1-я, 2-я і г. д. надпоймавыя тэрасы). Д. называюцца таксама некат. ўпадзіны, якія ўзніклі ад тэктанічных апусканняў зямной кары (Алайская даліна ў Сярэдняй Азіі і інш.). На мацерыковых схілах мораў і акіянаў ёсць падводныя Д.— працяг рачных Д. у месцах, некалі затопленых морам. Калі Д. праразае якое-н. узвышша на ўсю яго шырыню, утвараецца скразная даліна, або даліна прарыву (Д. ракі Сож паміж Мсціславам і Крычавам).




Схема паперочнага профілю даліны ракі: *1* — прытэрасавая пойма; *2* — цэнтральная пойма; *3* — прырэчная пойма; *4* — прырэчны вал.

Асн. працэсы ў развіцці Д.— паглыбленне і расшырэнне размывам (гл. *Эрозія*), намнажэнне рачных адкладаў (гл. *Алювій*). Профіль Д. амаль заўсёды асіметрычны, абодва схілы не падобныя адзін да аднаго. Гэта тлумачыцца геал. будовай, нахіламі паверхні, у якую ўрэзана Д., адхільнай сілай вярчэння Зямлі (гл. *Бэра закон*), дзеяннем грунтавых водаў і інш. На розных стадыях развіцця і ў розных фіз.-геагр. умовах Д. маюць разнастайны вонкавы выгляд. Паводле папярочнага профілю выдзяляецца некалькі асн. тыпаў далін. Цяснінны або шчыліны — глыбокія вузкія Д. са стромкімі ці навіслымі схіламі, характэрныя горным мясцінам. Каньёны — вузкія стромкабаржныя і глыбока ўрэзаныя Д., дно якіх занята ракой ва ўсю шырыню, са слаба акрэсленымі прыступкамі (тэрасападобнымі пляцоўкамі на іх схілах), пашыраны пераважна ў мясцовасцях з сухім кліматам. V-падобныя Д., парэзаныя крамі і лагчынамі, з тэрасападобнымі схіламі ад неаднолькавай цвёрдасці парод пераважаюць у мясцовасцях са значнай колькасцю ападкаў. Да іх належаць маладыя яры ў раёнах стэпавага клімату. Поймавыя (скрынепадобныя) Д. з плоскім дном, значна шырэйшым, чым рака ў межанны час. Рэчышча ўрэзана ў дно Д., якое толькі ў час паводкі заліваецца. Такія Д. з некалькімі шырокімі тэрасамі, пашыраныя пераважна на раўнінах, характэрны Беларусі. Карытападобныя, або трогі,— горныя Д., апрацаваныя ледавіком. Звычайна Д. ўтвараюць складаныя сістэмы, у якіх вылучаюцца галоўныя Д. (першага парадку) і бакавыя (другога парадку). У сваю чаргу Д. другога парадку з'яўляецца галоўнай і мае таксама бакавыя Д. (трэцяга парадку) і г. д. Вылучаюцца Д. падоўжаныя, выцягнутыя ўздоўж працяжэння пластоў, папярочныя, перпендыкулярныя да восяў складак і дыяганальныя. Падоўжаныя Д. ў адносінах да геал. будовы мясцовасці бываюць сінклінальнымі, антыклінальнымі і моноклінальнымі. Акрамя сучасных Д. існуюць пахаваныя Д., якія існавалі ў мінулыя геал. эпохі, а пазней запоўніліся разнастайнымі адкладамі. Найб. даследаваны Д. перадчацвярцічнага часу, выяўленыя свідраваннем. Днішчы самых глыбокіх з іх (напр., Дзвінска-Дняпроўскай амаль уздоўж сучасных Д. Дняпра і Зах. Дзвіны) на 70—120 м ніжэй узр. м. Асобныя адрэзкі Д. супадаюць з сучаснымі. У размеркаванні пахаваных і сучасных Д. галоўнае значэнне мае глыбінная геал. будова зямной кары, і перш-наперш размяшчэнне буйных тэктанічных парушэнняў і паслабленых зон. Часам рэкі выкарыстоўваюць лагчыны сцёку расталых ледавіковых водаў (Д. Сажа ад вытоку да г. п. Хіславічы). Вял. рэкі Беларусі маюць афармленыя Д., якія складаюцца з рэчышча, поймы і некалькіх надпоймавых тэрас. Найбольш шырокая Д. Прыпяці займае большую ч. Палесся і мае дзве надпоймавыя тэрасы, з іх найб. шырокая (да 50—60 км) 2-я надпоймавая. Дзве надпоймавыя тэрасы вылучаюць на Дняпры, Сажы, Іпуці і інш. На Зах. Дзвіне і Нёмане да 3—5 тэрас. Фарміраванне тэрас Д. на Беларусі адбылося ў выніку змены клімату і тэктанічных рухаў у час апошняга абледзянення і наст. паслядзедавікоўя.

Літ.: Щукин И. С. Общая геоморфология, т. 1, М., 1960; Горецкий Г. И. Аллювиальная летопись Великого Пра-Днепра, М., 1970.

Р. І. Лявіцкая. Мінск.

ДАЛМАТОЎСКІ Яўген Аронавіч [н. 22.4(5.5).1915, Масква], рускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1941. З сям'і юрыста. Скончыў Літ. ін-т імя Горкага (1937). Першы зб. «Лірыка» (1934). Паэзія Д. спалучае рэвалюц. страснасць з лірызмам, паказвае станаўленне духоўнага свету сав. чалавека (зб. «Песня пра Дняпро», 1942; «Вера ў перамогу», 1944; «Слова пра заўтрашні дзень», 1949, Дзярж. прэмія СССР 1950). У 50—60-я г. філас.-публіцыст. накіраванасць лірыкі Д. паглыбляецца (зб. «Вершы пра нас», 1964). Тэма пралет. інтэрнацыяналізму ў кн. «Афрыка мае форму сэрца» (1961) і «Дзяўчына ў белым» (1968). Аўтар шэрагу вершаў пра Беларусь. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Избранное, М., 1965; Из жизни поэзии, М., 1967; бел. пер.— у кн.: Руская савецкая паэзія, Мн., 1953.

А. Р. Жакаў. Мінск.

ДАЛУХАНАВА Зара (Заруі Агасьеўна; н. 15.3.1918, Масква), савецкая спявачка (меццо-сапрана). Нар. арт. Арм. ССР (1952) і РСФСР (1956). Скончыла муз.-пед. ін-т імя Гнесіных (1957). У 1941—44 салістка т-ра оперы і балета імя Спендыярава (Ерэван), з 1944 займаецца канцэртна-выканальніцкай дзейнасцю. Рэпертуар Д. разнастайны. Ёй уласціва выключнае пачуццё стылю. Дзярж. прэмія СССР 1951, Ленінская прэмія 1966.

Літ.: Михайловская Н. Зара Долуханова, М., 1958.

ДАЛЬ Уладзімір Іванавіч [літ. псеўд. Казак Луганскі; 10(22).11.1801, Луганск — 22.9(4.10).1872], рускі этнограф, мовазнавец і пісьменнік. Чл.-кар. (1838), ганаровы чл. Расійскай АН (1863). З сям'і ўрача. Скончыў мед. ф-т Дэрпцкага ун-та (1829), быў ваен. урачом. Даследаваў мову і побыт рус. народа. Аўтар прац «Пра гаворкі рускай мовы» (1852), «Прыказкі рускага народа» (1862), «Тлумачальны слоўнік жывой вялікарускай мовы» (т. 1—4, 1863—66), у якім распрацаваў каля 200 тыс. слоў і 30 тыс. прыказак і прымавак. У слоўніку багата бел. нар. лексікі. Яго высока ацаніў У. І. Ленін. Складаў слоўнікі бел. і ўкр. мовы. Апрацоўваў казкі («Рускія казкі», 1832, «Быліцы і небыліцы», кн. 1—4, 1833—39), пісаў этнагр. нарысы («Падалянка», «Цыганка», «Балгарка»), апавяд., аповесці.

Тв.: Полн. собр. соч., т. 1—10, СПб.— М., 1897—98; Толковый словарь живого великорусского языка, т. 1—4, М., 1955; Пословицы русского народа, М., 1957.

Літ.: Бессараб М. Владимир Даль, М., 1968; Булатов М. и Порудоминский В. Собирал человек слова..., М., 1969.

ДАЛЬМЕНЫ (ад брэтонскага tol стол+men камень), стараж. пахавальныя збудаванні з вялізных каменных глыбаў або пліт. Звычайна мелі адну камеру, круглую адтуліну для ўваходу. Часам засыпаліся зямлёй. У Д. хавалі аднаго ці некалькіх нябожчыкаў з прыладамі працы, посудам і ўпрыгожаннямі. У Еўропе (у т. л. ў Крыме і на Каўказе) і Паўн. Афрыцы найбольш пашыраны ў эпоху бронзы, у Індыі і Японіі — у жалезны век. Сустракаюцца на Пд Палесся; невял. каменная скрыня з трупаспаленнем знойдзена каля в. Зыкава Лагойскага р-на.

Літ.: Куфтин Б. А. Материалы к археологии Колхиды, т. 1, Тбилиси, 1949; Чайлд Г. У истоков европейской цивилизации, пер. с англ., М., 1952.

У. Ф. Ісаенка. Мінск.

ДАЛЬНАЗОРКАСЦЬ (гіперметрапія), недахоп зроку, які перашкаджае выразна бачыць на блізкай адлегласці. Д. бывае ад слабой пераламляльнай здольнасці аптычнай сістэмы вока (рэфракцыйная Д.) або ад занадта кароткай пярэдне-задняй восі вока (восевая Д.). У дальназоркім воку прамяні святла, якія ідуць ад далёкіх і блізкіх прадметаў, пераслаюцца і збіраюцца за сятчаткай вока, таму прадметы відаць невыразна.

Адрозніваюць тры ступені Д.— слабую, сярэднюю і высокую. Пры слабой і сярэдняй хворыя добра бачаць блізкія і далёкія прадметы, бо акамадацыйная здольнасць вока (магчымасць мяняць крывізну і таўшчыню крышталіка) добрая. На высокай ступені Д. хворыя кепска адрозніваюць прадметы здалёку і зблізку, нават з карэкцыяй. Праз некалькі гадзін працы (чытанне, пісьмо) пачынаюцца боль галавы, моргание, галавакружэнне, чырванеюць павекі. У дзяцей ад Д., асабліва калі ступень не неаднолькавая ў абодвух воках, развіваецца касавокасць. Выпраўляюць Д. акулярамі з выпуклымі (збіральнымі) шкельцамі.

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969.

Т. В. Бірыч. Мінск.

ДАЛЬНАМЕР, аптычная, гука-, радыё-, ці святлотэхнічная прылада для вызначэння адлегласці без непасрэдных вымярэнняў.

Аптычныя Д. (артылерыйскія, геадэзічныя і інш.) вызначаюць адлегласць да прадмета на прынцыпе рашэння востраугольнага трохвугольніка, калі відома адна яго старана (база Д.) і прылеглы вугал. Акустычныя, радыё-, святлодальнамеры (гідралакатары, *радыёлакатары*, *лазеры*) вымяраюць адлегласць на часе праходжання гукавых ці эл.-маган. хваляў да цэлі і назад. Паказанні на шкале Д. даюцца аўтаматычна.

Літ.: Пащенков В. З. Радиоэлектроника в маркшейдерско-геодезических работах (радио- и светодальномеры), М., 1968.

ДАЛЬТАНІЗМ, прыроджаная або набытая (рэдка) няздольнасць адрозніваць некат. колеры (пераважна чырвоны і зялёны). Упершыню апісаны англ. фізікам Дж. Дальтонам (1794). Бывае ў 7—8% мужчын і 0,4—0,5% жанчын. Распазнаюць з дапамогай спец. (поліхраматычных) табліц і апарата (анамаласкопа). Людзі з Д. адрозніваюць у спектры два колеры — жоўты і сіні. Іх не дапускаюць працаваць на транспарце, у авіяцыі і інш.

Літ.: Архангельский В. Н. Глазные болезни, 2 изд., М., 1969.

ДАЛЯЖАЛЬ Мікалай Антонавіч [н. 15(27).10.1899, с. Амельнік Аляксандраўскага пав. Екацярынаслаўскай губ.], савецкі цеплатэхнік. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1953). Герой Сац. Працы (1949). У 1942—53 дырэктар НДІ хім. машынабудавання (Масква). У апошнія гады працуе ў галіне ядз. энергетыкі. Асн. працы па ядз. энергетыцы, пытаннях праектавання цепласілавых установак і канструявання кампрэсарных машын для хім. прамысловасці. Гал. канструктар рэактара першай атамнай эл. станцыі СССР. Дзярж. прэміі СССР 1949, 1951, 1953. Ленінская прэмія 1957. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі.

Тв.: Основы проектирования паросиловых установок, М.— Л., 1933; (разам з Дз. І. Блахінцавым і А. К. Красіным) Реактор атомной электростанции АН СССР, «Атомная энергия», 1956, № 1.

Літ.: К 70-летию со дня рождения академика Николая Антоновича Доллежаля, «Известия АН СССР. [Сер.] энергетика и транспорт», 1969, № 5.

ДАМАВАЯ МЫШ (Mus musculus), млекакормячая жывёла сям. мышыных атр. грызуноў. Пашырана на ўсім зямным шары (акрамя Арктыкі і Антарктыкі), у СССР амаль на ўсёй тэр. (няма на Крайняй Пн і ў некат. глухіх таежных р-нах).

Даўж. цела 6—10,8, хваста 4,2—10,2 см. У халодным і ўмераным паясах жыве ў складскіх і жылых памяшканнях або паблізу іх, на Пд і ў прыродных умовах. Усеядная. Нараджае некалькі разоў на год па 4—8 мышанят. Шкодзіць пасевам збожжавых культур, знішчае і засмечвае прадукты, псуе мэблю, кнігі, электраправодку. Распаўсюджвае чуму, тулярэмію і інш. хваробы.

Літ.: Гл. пры арт. *Грызуны*.

ДАМАВІК (хаванец, хатнік, гаспадар), персанаж славянскай міфалогіі; бажаство дому і маёмасці, дух продкаў. Уяўляўся ў выглядзе калматага старога, які нібыта жыве пад печчу, таму звaўся падпечнікам, запечнікам. Дух, які жыве ў хляве, называўся хлеўнікам, у гумне — гуменнікам, ёўнікам. Часам гэта варожы дух, які шкодзіць людзям, палохае іх. З верай у Д. былі звязаны абрады кармлення Д., запрашэння яго на наваселле.

ДАМАВІЦК, вёска ў Раваніцкім с/с Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл., на левым беразе р. Уса. Цэнтр саўгаса «Дамавіцкі». За 15 *км* на ПнУ ад Чэрвеня, 80 *км* ад Мінска, 40 *км* ад чыг. ст. Смалявічы. 482 ж., двароў 157 (1971). Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі, фельч.-ак. пункт, сталовая, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам Айч. вайны.

ДАМАВЫЯ ГРЫБЫ, базідыяльныя грыбы, якія выклікаюць гніенне драўніны ў будынках. На Беларусі вядома каля 20 відаў. Найб. пашыраны і шкодны сапраўдны дамавы грыб (дамавая губка) — Serpula lacrymans.

Міцэлій грыба спачатку белы, ватападобны з ружавата-жоўтымі плямкамі, потым мае выгляд тонкіх попельна-шэрых плёнак з кропелькамі вадкасці на паверхні. Развіваецца ў вільготных месцах з дрэнай вентыляцыяй. Размнажаецца спорамі і кавалкамі міцэлію. Шкодзіць таксама Д. г. белы, плёначны, пласцінчны. Меры барацьбы: праправанне драўніны гарачым паветрам, выдаленне пашкоджаных частак, апрацоўка фтарыстым натрыем (гл. *Антысептычныя сродкі*).

Літ.: Головко А. И. Домовые грибы — разрушители древесины и меры борьбы с ними, Мн., 1966; Кудряшева З. Н. Микология с основами фитопатологии, Мн., 1968. *З. Н. Кудрашова.* Мінск.

ДАМАМЕРЫЧЫ, вёска ў Клімавіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Сасноўка. Цэнтр сельсавета. За 14 *км* на Пн ад Клімавіч, 138 *км* ад Магілёва, 16 *км* ад чыг. ст. Клімавічы, на шашы Крычаў — Рослаўль (РСФСР). 329 ж., гасп. 93 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін.

ДАМАНАВА, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе Грыўды; чыг. ст. на лініі Брэст — Баранавічы. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Даманава». За 17 *км* на ПнУ ад Іванцэвіч, 151 *км* ад Брэста, аўтобусныя зносіны са Слонімам. 1335 ж., гасп. 410 (1971). Гута, шыферны з-д, цагельня, майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, сталовая, 4 магазіны. 2 помнікі на 3 брацкіх магілах 98 сав. воінаў, партызанаў і землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАМАНАВІЦКАЯ КАНАВА, левы прыток Случы (бас. Прыпяці). Даўж. 29 *км*. Адгалінаўваецца ад канала Асавецкі за 2 *км* на Пн ад в. Абідземля ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Вадазбор (333 *км*²) — плоская моцна забалочаная і залесеная раўніна, перасечаная асушальнымі канавамі. Выкарыстоўваецца як водапрыёмнік пры асушэнні балот.

ДАМАНАВІЧ (Домановіћ) Радае (4.2.1873, в. Оўсіштэ каля г. Крагуевац у Сербіі — 4.8. 1908), сербскі пісьменнік. Па адукацыі філосаф. У сатыр. аповесцях і апавяданнях («Не разумею!», 1898; «Адмена страсцей», 1899; «Правадыр»; 1899; «Каралевіч Марка другі раз сярод сербаў», 1901; «Страдыя», 1902; «Мёртвае мора», 1902; «Дзівосны сон», 1903) з рэвалюц.-дэмакр. пазіцый высмеяў і асудзіў паліцэйска-бюракрат. манархісцкі рэжым тагачаснай Сербіі.

Тв.: Рус. пер.— Повести и рассказы, М., 1956; Страдия, М., 1957.

Літ.: Богданов М. Б. Политическая сатира Радое Домановича, у кн.: Литература славянских народов, в. 3, М., 1958.

ДАМАНАВІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кутузава. За 29 *км* на Пн ад Калінкавіч, 151 *км* ад Гомеля, 5 *км* ад чыг. ст. Халодкі, каля шашы Мінск — Мазыр (2,5 *км*). 779 ж., двароў 253 (1971). Агародніна-насушыльны з-д, пякарня, сепаратарны пункт, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт. У снеж. 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 975 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАМАНАВІЧЫ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 51 *км* на ПдУ ад Салігорска, 184 *км* ад Мінска, каля шашы Старобін — Скаўшын (2,5 *км*). 496 ж., двароў 133 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі, магазін.

ДАМАНЕЎСКІ (Даманоўскі) Фабіян (г. п. і см. невяд.), беларускі мысліцель, ідэолаг *контррэфармацыі* 2-й пал. 16 ст. Крытыкаваў Біблію, лічыў Хрыста не богам, а простым чалавекам, адмаўляў неўміручасць душы, існаванне замагільнага свету. У 1589 з С. *Будным* вёў дыспут з езуітамі ў Полацку, дзе даказваў, што, калі чалавек памірае, яго душа гіне разам з целам. У спрэчцы Буднага з плебейска-сялянскімі ідэалагамі *антытрынітарыяў* пра свецкую ўладу падтрымліваў пункт погляду Буднага. У вершы «Эпіграма на герб Лясот», надрукаваным у кн. Буднага «Пра свецкую ўладу», выказваў думку, што ўсякая ўлада павінна кіравацца і кантралявацца розумам.

Літ.: Подокшин С. А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы, Мн., 1970; Lukaszewicz J. Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwie, t. 2, Poznań, 1843; Merczyng H. Polscy deiści i wolnomyśliciele za Jagiellonów, «Przegląd historyczny», 1911, t. 12.

С. А. Падокшын. Мінск.

ДАМАНЕЎСКІ (Даманоўскі) Язэп (канец 16 — 1-я пал. 17 ст.), беларускі мысліцель, сацыніянін (гл. *Сацыніянства)*, паэт-гуманіст. З Янам *Ліцыніем Намыслоўскім* у 1594 у Навагрудку ўдзельнічаў у дыспуце з езуітам М. Смігleцкім пра спрадвечнасць Хрыста. У канцы 90-х г. 16 ст. стаў на чале понадарантызму, схіліўся да атэізму; за гэта ў 1600 на сінодзе ў Навагрудку выключаны з сацыніянскай абшчыны. Адышоўшы ад актыўнай грамадскай дзейнасці, займаўся паэт. творчасцю. У 1620—23 на лац. і польскай мовах выйшлі яго вершаваныя творы «Афарызмы Саламона ў паэтычным выкладанні», «Жыццё сельскае і гарадское» і інш. З пазіцый гуманіст. этыкі асуджаў спосаб жыцця і норавы сучаснага яму феад. грамадства, апяваў працавітасць, умеранасць, сумленнасць, імкненне да ведаў, чалавечы розум.


Літ.: Парэцкі Я. Язэп Даманоўскі, «Полымя», 1968, № 2; гл. таксама літ. пры арт. *Даманеўскі Фабіян.* *С. А. Падокшын.* Мінск.

ДАМАНОЎШЧЫНА, вёска ў Сугваздаўскім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 7 *км* на У ад Валожына, 78 *км* ад Мінска, 24 *км* ад чыг. ст. Валожын. 59 ж., гасп. 23 (1971). Клуб, фельч.-ак. пункт. Помнік аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДАМАСК, сталіца Сірыі. Размешчаны ў перадгор'ях Антылівана. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог. Міжнар. аэрапорт. 790 тыс. ж. (1968).

Вядомы з 16 ст. да н. э., калі знаходзіўся пад уладай егіп. фараонаў. У 10—8 ст. да н. э. цэнтр Дамаскага царства. З 8 да 1 ст. да н. э. пад уладай Асірыі (з 732 да н. э.), Персіі (з 538 да н. э.), Аляксандра Македонскага і яго пераемнікаў (з 332 да н. э.). У 64 н. э. заняты рымлянамі. У 30-я г. 7 ст. Д. заваявалі арабы. У 661—750 сталіца *Амеядаў халіфата.* У 1401 зруйнаваны войскам Цімура. У 1516—1918 у складзе Асманскай імперыі. З 1920 гал. горад франц. падмандатнай тэр. Сірыі. З 1941 сталіца незалежнай Сірыі. Збераглiся рэшткі сцен, вежаў і інш. помнікаў эліністычна-рымскага часу. У 705—715 на месцы хрысц. базілікі пабудавана манумент. мячэць Амеядаў з унікальнай мазаікай. У перыяд росквіту архітэктуры створаны купальныя пахавальні, медрэсэ, мячэці, марыстаны (бальніцы). Ад 16 ст. засталіся мячэці Сулеймана і Селіміе, ад 18 ст. медрэсэ Абд Алах Паша, жылыя дамы і інш. У 20 ст. пачата рэканструкцыя Д., новыя кварталы будуюцца побач са старой арабскай часткай горада.

Развіта вытворчасць прадуктаў, тканін, абутку, шкла, медыкаментаў, кабелю. Мылаварныя з-ды, дывановая ф-ка. Майстэрні аўтарамонтныя, ліцейныя, швейныя, гарбарныя, маст. апрацоўкі дрэва і металаў. Арабская АН



Дамаск. Жылыя дамы ў раёне Аль-Абіяд.

(з 1919), ун-т (з 1923), Ін-т усходняй музыкі, ваенная акадэмія і калеж. Вышэйшыя вучылішчы сац. навук і політэхнічнае. Б-кі (у т. л. нацыянальная пры Арабскай АН); музеі: Нацыянальны, усх. быту, ваенны.

ДАМАСКАЯ СТАЛЬ, гл. *Булат.*

ДАМАСКІ ХАЛІФАТ, гл. *Амеядаў халіфат.*

«ДАМАСТРОП», помнік старажытнарускай літаратуры 16 ст. Узнік у асяроддзі наўгародскага баярства. У сярэдзіне 16 ст. яго апрацаваў пратапоп Сільвестр, прыбліжаны цара Івана Грознага. «Д.» — своеасаблівы маральна-этычны кодэкс, які сцвярджаў поўнае і сляпое падначаленне чалавека рэлігіі, царкве і цару, уладзе гаспадара ў сям'і. Садзейнічаў умацаванню цэнтралізаванай феад. дзяржавы.

ДАМАТКАНАВІЧЫ, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Авангард». За 8 *км* на ПнЗ ад Клецка, 148 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Клецк. 989 ж., гасп. 271 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, вет. пункт, адда. сувязі, магазін. На брацкай магіле помнік 31 сав. воіну, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАМАЧОВА, гарадскі пасёлак (з 1940) у Брэсцкім р-не Брэсцкай вобл. (у 1940—56 раённы цэнтр). За 52 *км* на Пд ад Брэста, 3 *км*



Дамачова. Сярэдняя школа.

ад чыг. ст. Дамачова, 2 *км* ад шашы Брэст — Тамашоўка. 4,2 тыс. ж. (1969). Прамкамбінат (мэблевы і чарапічны цэхі), хлебакамбінат, маслазавод, швейная майстэрня, камбінат камунальных прадпрыемстваў, лясніцтва. Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом культуры, кінатэатр, б-ка, бальніца, санаторый. На тэр. пасялковага Савета брацкая магіла 54 дзяцей і выхавальніцы Дамачоўскага дзіцячага дома, расстраляных 23.9.1942 ням.-фаш. акупантамі. Брацкая магіла 80 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАМАШКАЎСКАЕ, возера ў басейне р. Бярэзіны, у Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Пл. 0,67 *км*². Даўж. 1,6 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,4 *км*. Вадазбор (11,9 *км*²) дробнаўгорысты. Водзяцца плотка, шчупак, акунь.

ДАМАШЭВІЧ Уладзімір Максімавіч (н. 17.2. 1928, в. Вадзяціна Баранавіцкага пав. Навагрудскага ваяводства), беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Скончыў БДУ (1953). Працаваў рэдактарам выд-ваў «Народная асвета», «Беларусь», на рэсп. радыё. З 1967 у час. «Полымя». Друкуецца з 1958. Першы зб. «Заклінаю ад кулі» (1960). Жыццё сялянства былой Зах. Беларусі, барацьба сав. народа супраць ням.-фаш. захопнікаў, адбудова нар. гаспадаркі ў першыя пасляваен. гады — асн. тэмы творчасці Д. Прозе пісьменніка ўласцівыя цягa да незвычайных сюжэтаў, увага да ўнутранага свету герояў, стрыманасць у фарбах, адчуванне жывой нар. мовы.

Тв.: Між двух агнёў, Мн., 1963; Абуджэнне, Мн., 1968; Кавалак нялёгкай дарогі, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.

Літ.: Александровіч С. У пошуках гераічнага і незвычайнага, «Полымя», 1960, № 8;

Ярош М. Творчы неспакой пісьменніка, там жа, 1963, № 12; Савицкий О. В суровой борьбе, «Дружба народов», 1961, № 1; Гиппомедов В. Факт и его осмысление, там жа, 1969, № 4.
А. А. Лойка. Мінск.

ДАМБА (ад гал. dam), гідратэхнічнае збудаванне для засцярогі нізін ад разліваў рэк, марскіх прыліваў і для кіравання рачнымі плынямі.

Падзяляюцца на агараджальныя, струменекіравальныя і транспартныя. Агараджальныя засцерагаюць акваторыі портаў, падыходныя каналы да шлюзаў і іншыя збудаванні ад хваляў, ледаходаў і інш. шкодных дзеянняў. Асобны від агараджальных Д.— хваляломы і молы. Струменекіравальныя Д. надаюць плыні неабходны рэжым і накіраванасць. Транспартныя будуюцца для пракладкі дарог цераз поймы рэк і залівы вадасховішчаў. На Беларусі Д. вядомыя з даўніх часоў. Робяцца пры буд-ве вадасховішчаў і водных сістэм (напр., на *Заслаўскім вадасховішчы, Вілейска-Мінскай водной сістэме*).

ДАМБАВЕЦКІ Аляксандр Станіслававіч (1840 — г. см. невяд.), рэдактар 3 тамоў выд. «Спроба апісання Магілёўскай губ...» (Магілёў, 1882—84). Магілёўскі губернатар у 1872—93, сенатар з 1893. Дбаў пра развіццё с. гасп., будаўніцтва лячэбных устаноў, школ. Садзейнічаў вывучэнню гісторыі, археалогіі, этнаграфіі Магілёўшчыны; ініцыятар адкрыцця гістар.-этнагр. музея ў Магілёве (1879).

ДАМБОЎСКІ (Dembowski) Эдвард (25.4.1822, Падгужы каля Кракава — 27.2.1846), польскі рэвалюцыйны дэмакрат, філосаф-матэрыяліст. У 1839—43 чл. падпольнай рэвалюц. арг-цыі «Саюз польскага народа», рэд. прагрэс. час. «Przegląd naukowy» («Навуковы агляд»), з 1844 чл. познанскага ЦК «Польскага дэмакратычнага таварыства», арганізатар рэвалюц. барацьбы ў Галіцыі. У 1845—46 стварыў паўстанцкую арг-цыю ў Львове, адзін з найб. радыкальных кіраўнікоў Кракаўскага паўстання 1846, загінуў у час яго разгрому аўстр. войскамі. Светапогляд Д. складваўся ў непарыўнай сувязі з рэвалюц. дзейнасцю. Тэарэт. аснова паліт. і сацыялагічных поглядаў Д.— яго «філасофія творчасці», дзе рабілася спроба спалучыць думку і дзеянне, разумнасць гістар. працэсу з прагрэсам свабоды. Прынцып «творчасці», паводле Д., мае дыялект. характар. Разумеючы дыялектыку як тэорыю развіцця гістар. працэсу, Д. бачыў замест гісторыі ў заканамерным расшырэнні межаў грамадскай свабоды, якая рэалізуецца ў паліт. і сац. вызваленні нар. мас. Крытыкаваў ідэалізм і метафіз. матэрыялізм за адрыў ад практыкі. Рэлігію разглядаў як навязанае народу «ярмо фанатызму і забабонаў». Маральны сэнс чалавечага існавання бачыў у яго адзінстве з калектывам, у падпарадкаванні індывідуальных мэт барацьбе ўсяго народа. Адзін з заснавальнікаў рэвалюц.-дэмакр. эстэтыкі ў Польшчы. Крытыкаваў тэорыю «чыстага мастацтва», сцвярджаў, што мастацтва павінна служыць барацьбе працоўных мас за сваё вызваленне. Адстойваў прынцыпы рэалізму і дэмакрат. ідэйнасці мастацтва.

Тв.: Рус. пер.— у кн.: Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей, т. 3, М., 1958.
Літ.: Нарский И. С. Мировоззрение Э. Дембовского, М., 1954 (ёсць спіс прац Д.).
А. С. Каляўчэня. Мінск.

ДАМБРОЎСКАЯ (Dąbrowska) Марыя (6.10.1889, в. Русаў Калішскага пав.— 19.5.1965), польская пісьменніца. З шляхты. Скончыла Брусельскі ун-т (1911). Першыя зб. апавяданняў «Дзеці айчыны» (1918), «Галінка чарэшні...» (1922), «Усмешка дзяцінства» (1923). Літ. прызнанне прынёс Д. зб. «Людзі адтуль» (1926), дзе паказаны высокія маральныя якасці простых сялян-парабкоў. Асн. творчае дасягненне Д.— тэтралогія «Ночы і дні» (1932—34), у якой рэалістычна адлюстравана жыццё польскай шляхты, глыбокія сац. змены ў краіне з канца 19 ст. да пач. 1-й сусв. вайны. Праблемы сацыяліст. пераўтварэнняў у польскай вёсцы пастаўлены ў аповесці «На вёсцы вяселле» (1955). Аўтар гістар. драм «Сіроцкі геній» (1939), «Станіслаў і Багуміл» (1945—46), літ.-крытычных артыкулаў пра Б. Пруса, Л. Талстога, М. Гогаля і інш. Дзярж. прэмія ПНР 1955.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Ад Буга да Одры. Апавяданні польскіх пісьменнікаў, Мн., 1969; рус. пер.— Рассказы, М., 1957; Ночи и дни, т. 1—2, М., 1964.

ДАМБРОЎСКІ Канстанцін Міхайлавіч [н. 2(15).4.1908, в. Астрашанка Мазырскага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. У Чырв. Арміі з 1929. У партызанах з ліп. 1941: камандзір узвода; з вер. 1943 камандзір *партызанскай брыгады Лельчыцкай* Палескай вобл. У вер. 1944 — жн. 1946 на парт. рабоце ў Лагішынскім РК КП(б)Б. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

ДАМБРО́ЎСКІ (Dąbrowski) Яраслаў (13.11.1836, г. Жытомір — 23.5.1871), дзеяч польскага і міжнар. рэвалюц. руху. З дваран. Вучыўся ў кадэцкіх карпусах у Брэсце (1845—53) і Пецярбурзе (1853—55). З 1855 у арміі. У час навучання ў Акадэміі ген. штаба (1859—61) з З. *Серакоўскім* узначальваў польскую рэвалюц. арг-цыю ў Пецярбурзе, прапагандаваў ідэі рус.-польскага рэвалюц. саюзу. З пач. 1862 у Варшаве, прызнаны кіраўнік *«чырвоных»*, чл. *Цэнтральнага . нацыянальнага камітэта*, канспіратыўны начальнік Варшавы. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў *Камітэта рускіх афіцэраў у Польшчы*. Правёў нарады ў Вільні з рэвалюцыянерамі Літвы і Беларусі. Разлічваючы на спрыяльную сітуацыю і падтрымку рус. рэвалюц. сіл, распрацаваў план неадкладнага ўзбр. паўстання, які адхілілі *«белыя»*. У жн. 1862 арыштаваны, але і з турмы кіраваў падрыхтоўкай паўстання. У снеж. 1864 уцёк на дарозе на катаргу і з дапамогай рус. рэвалюцыянераў выехаў за мяжу. Адзін з кіраўнікоў польскай дэмакр. эміграцыі, блізкі з А. І. Герцэнам, Дж. Гарыбальдзі. Працы па ваен. справе паставілі Д. ў лік аўтарытэтных спецыялістаў-тэарэтыкаў. З крас. 1871 генерал



Парыжскай камуны, узначальваў участак фронту, армію, потым усе ўзбр. сілы Камуны. На пасяджэнні ЦК Нац. гвардыі Д. прапанаваў неадкладна наступаць на Версаль і ліквідаваць урад Цьера. Адхіленне гэтай прапановы — адна з гал. памылак Камуны. Загінуў у баі з версальцамі. У. І. Ленін пісаў, што памяць Д. непарыўна звязана з найвялікшым рухам пралетарыяту ў 19 ст.

Тв.: Listy, Warszawa, 1960; Рус. пер.— у кн.: Избранные произведения прогрессивных польских мыслителей, т. 3, М., 1958.
Літ.: Маркс К. Гражданская война во Франции, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 17; Ленін У. І. Нацыянальнае пытанне ў нашай праграме, Тв., т. 6 (Полн. собр. соч., т. 7); Дьяков В. Ярослав Домбровский, М., 1969 (Жизнь замечательных людей).
Г. В. Кісялёў. Вільнюс;
І. П. Шпадарук. Мінск.

ДАМДЗІНСУРЭН Цэндэйн (н. 14.9.1908, Усходні аймак), мангольскі пісьменнік і вучоны. Акад. АН МНР. Чл. МНРП з 1932. З сям'і качэўніка-жывёлавода. Вышэйшую адукацыю атрымаў у СССР. У 1953—58 старшыня СП МНР. Друкуецца з 1926. У аповесці «Дзяўчына, якой выракліся» (1929) паказаў цяжкае мінулае манг. народа, заклікаў да ўдзелу ў буд-ве новага жыцця. Аўтар вершаў пра гераізм сав. народа ў Айч. вайну («Палярная ворка», «Пасланне савецкаму народу»), апавяданняў пра савецка-манг. дружбу («Абодва — мае сыны»), паэмы «Мая сівая маці» (1934), зб. апавяданняў «Дзіўнае вяселле» (1966), прац па літ.- і мовазнаўстве. Дзярж. прэміі МНР 1946, 1951.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1958.

ДАМ'Е (Daumier) Анарэ (26.2.1808, Марсель — 11.2.1879), французскі жывапісец і літограф. Адзін з найб. значных прадстаўнікоў рэалізму ў зах.-еўрап. мастацтве 19 ст. Фарміраванне Д. як майстра паліт. карыкатуры звязана з рэвалюцыяй 1830. У сваіх літаграфіях мастак выкрываў палітыку Луі Філіпа («Гарганцюа», 1831; «Закападаўчае чэрава», 1834; «Вуліца Транснанен», 1834), Напалеона III і яго прыхільнікаў («Апошняя нарада былых міністраў», 1848; «Ратапуаль», 1850), з дэмакр. пазіцый выкрываў заганы бурж. грамадства, высмейваў абмежаванасць і самаздаволенасць буржуа (графічныя серыі «Карыкацюрана», 1836—38; «Рабер Макер», 1840—42; «Людзі юстыцыі», 1845—48). Гал. тэма яго жывапісу (50—60-я г.) — жыццё простых людзей, іх рэвалюц. барацьба, штодзённая цяжкая праца («Сям'я на барыкадзе», 1848—49; «Паўстанне», цыкл «Прачкі»). Стварыў серыі карцін пра





Ян Дамель. Разбітыя войскі Напалеона ў Вільні. Акварэль. Дзярж. маст. музей Літоўскай ССР. Вільнюс.

цырк, т-р, мастакоў. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Графіка*.

Літ.: Калитина Н. Оноре Домье. М., 1955.

ДАМЕЙКА Ігнат Іпалітавіч (3.7.1802, маёнтак Нядзведка Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 23.1.1889), геолаг, даследчык Чылі. Скончыў Віленскі ун-т, быў пад арыштам як член гуртка філаматаў (гл. *Філаматы*). Удзельнік паўстання 1830—31 у Польшчы і на Беларусі, пасля яго разгрому інтэрніраваны прускімі ўладамі. Скончыў Горную школу ў Парыжы (1837), з 1838 праф. мінералогіі ў Какімба і Сант'яга (Чылі). Арганізаваў шырокае вывучэнне геалогіі і мінералогіі Андаў Чылі, пустыні Атакама, Араўканіі, заснаваў метэаралогію ў Чылі, стварыў этнагр. музей. У 1884 наведаў радзіму. Памёр у Сант'яга. Навук. працы Д. надрукаваны ў 5 тамах. Яго імем наз. мінерал дамейкіт, выкапнёвы слімак Nautilus Domeycus, фіялка Viola Domeykiana, аманіт чылійскі Amonites Domeykanus, раб. пасёлак на Пн Чылі, хрыбет у Андах.

Літ.: Грицкевич В. П. Путешествия наших земляков, Мн., 1968, с. 96—119; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе, Мн., 1969, с. 130—138; Худзиковская Я. и Ястер Я. Люди великой отваги, пер. с польск., М., 1957, с. 115—143; Brzoza J. Ignacy Domeyko. Powieść biograficzna, Katowice, 1961.

ДАМЕЛЬ (Dāmelis; Дамеліс Іонас Крыстафорас) Ян [1780, г. Мітава, Курляндыя — 18(30).8.1840], жывапісец. Пакінуў значны след у мастацтве Літвы і Беларусі. Вучыўся ў Віленскім ун-це ў Ф. Смуглевіча і Я. Рустэма (скончыў ун-т у 1809, выкладаў да 1820). У 1820—22 у ссылцы (Табольск, Томск, Енісейск). З 1822 у Мінску, у 1836 наведаў Пецярбург. Вядомы як гістар. жывапісец [«Смерць магістра крыжакоў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам», «Хрышчэнне Вольгі», «Смерць Глінскага», «Павел I вызваляе з палону Касцюшку», «Смерць кн. Панятоўскага», «Чарнецкі пераплывае Піліцу», «Разбітыя войскі Напалеона ў Вільні», «Пераправа французаў цераз Бярэзіну» (не закончаная) і інш.], аўтар карцін на рэліг. тэмы («Зняцце з крыжа», «Агар у пустыні»,

«Хрыстос і самарыцянка»), партрэтыст (партрэты А. Хорвата з жонкай, губернатара Гіцэвіча, М. М. Спяранскага, Равічавай з сынам, ксяндза Ф. Н. Галанскага, аўтапартрэт) і рысавальшчык (малюнкі на тэмы нар. быту, партрэты: Крыжнікава, Томаса дэ Берваля і інш.). Творчасць Д. сфарміравалася пад уплывам класіцызму, але ў шэрагу твораў («Заход сонца ў Табольску», «Ноч ва Уральскіх гарах» і інш.) адчуваецца імкненне да рамант. адлюстравання рэчаіснасці.

Літ.: Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960 (бібліягр.); Дробов Л. Иван Дамель, «Неман», 1961, № 3. *Л. Н. Дробаў.* Мінск.

ДАМЁН (лац. dominium уладанне), спадчыннае зямельнае ўладанне феадала (караля, герцага, графа) у сярэднія вякі ў Зах. Еўропе. Быў у поўным уладанні феадала. Каралеўскі Д. папаўняўся канфіскацыяй вял. уладанняў (у т. л. царкоўных) і інш., быў фондам для падаравання васалам. Частку *вотчыны* з асабістай гаспадаркай феадала называюць сеньярыяльным Д.

Літ.: Колесницкий Н. Ф. Феодальное государство (VI—XV вв.), М., 1967.

ДАМІНАНТА (фізіял.), часовы ачаг узбуджэння ў цэнтр. нерв. сістэме, які пануе ў пэўны момант, мае павышаную адчувальнасць да раздражненняў і здольны ўплываць на работу інш. нерв. цэнтраў (напр., пры глытанні, дэфекацыі, мочаспусканні ў жывёл рэзка затарможваюцца ўсе інш. рэфлекторныя рэакцыі). Тэрмін Д. ўвёў (1923) сав. фізіёлаг А. А. Ухтамскі.

Літ.: Павлов И. П. Полн. собр. соч., т. 3, (кн. 1—2), 2 изд., М.—Л., 1951; Ухтомский А. А. Учение о доминанте, Собр. соч., т. 1, Л., 1950.

ДАМІНАНТНАСЦЬ, даміпаванне (біял.), пераважнае дзеянне аднаго з пары бацькоўскіх генаў. Выяўляецца ў тым, што дамінантны алель (адзін з пары гамалагічных, альтэрнатыўных генаў) больш-менш яўна прыгнятае з'яўленне другога, рэцэсіўнага алеля.


З'яваю Д. часткова тлумачыцца тое, што нашчадак можа быць больш падобны да аднаго з бацькоў, пягледзячы на аднолькавы ўклад абодвух у яго генетычную канстытуцыю (гл. *Мендэля закоцы*). На малекулярным узроўні з'ява Д. тлумачыцца тым, што дамінантны ген (алель) выклікае ўтварэнне ферменту, які адказвае за развіццё пэўнай прыкметы (рэцэсіўны ген не выклікае ўтварэння ферменту, або фермент утвараецца слабаактыўны).

Літ.: Лобашев М. Е. Генетика, 2 изд., Л., 1969.

ДАМІНІКАНСКАЯ РЭСПУБЛІКА (Republica Dominicana), дзяржава ў Вест-Індыі, займае ўсх. частку в-ва Гаіці. Пл. 48,4 тыс. *км²*. Нас. 4324 тыс. чал. (1970). Сталіца Санта-Дамінга (655 тыс. ж., 1969). Дзейнічае канстытуцыя, прынятая ў 1966. На чале дзяржавы і ўрада стаіць прэзідэнт, які выбіраецца на 4 гады. Заканадаўчая ўлада ажыццяўляецца Нац. кангрэсам, які складаецца з сената і палаты дэпутатаў.



Прырода. Каля паловы тэр. Д. Р. занята гарамі.



У цэнтр. частцы краіны з ПнЗ на ПдУ цягнецца Кардыльера-Сентраль з найвышэйшым пунктам г. Дуартэ (3175 *м*). Уздоўж паўн. ўзбярэжжа падымаюцца вапняковыя горы — Кардыльера-Септэнтрыяналь, выш. да 1249 *м*. Паміж хрыбтамі і на ўзбярэжжы — урадлівыя даліны. Клімат трапічны пасатны. Т-ра паветра ад 23 да 25 °С у студз. і ад 28 да 29 °С у ліп. Ападкаў 1000—2000 *мм* за год. Бываюць ураганы. Рэкі невялікія горныя, часткова выкарыстоўваюцца для арашэння. У гарах трапічныя лясы, пераважна лістападныя з каштоўнымі пародамі дрэў. У больш сухіх раёнах — саваны і хуставыя зараснікі. Да выш. 600 *м* схілы гор пад плантацыямі трапічных культур. Жывёльны свет збеднены.

Насельніцтва. Большасць насельніцтва дамініканцы. Расавы склад: мулатаў 65%, неграў 20 і белых 15%. Дзярж. мова іспанская, рэлігія каталіцкая. Сярэдняя шчыльнасць 89 чал. на 1 *км²*. Найбольш густа заселены на Пн даліна р. Юны і на Пд узбярэжжа вакол г. Санта-Дамінга. Гарадскога насельніцтва каля 30%. Другі па велічыні горад Д. Р.— Сант'ягa, гандлёвы і транспартны вузел на Пн краіны.

Гістарычная даведка. Да канца 15 ст. тэрыторыю Д. Р. населялі індзейскія плямёны, якія мелі яшчэ родавы лад. Пасля адкрыцця в-ва Гаіці Х. Калумбам (1492) тут усталяваўся ісп. калан. рэжым. Да канца 17 ст. гісторыя Д. Р. непарыўна звязана з гісторыяй дзяржавы *Гаіці*. У канцы 16 — пач. 17 ст. за панаванне на Гаіці змагаліся Францыя, Англія і Іспанія. У канцы 17 ст. зах. часткі в-ва адышла да Францыі, а ўсходняя (назву атрымала ад г. Санта-Дамінга) асталася пад уладаю Іспаніі. У перыяд *вайны за незалежнасць іспанскіх калоній у Амерыцы 1810—26* Санта-Дамінга абвясціла незалежнасць і далучылася да рэспублікі Вялікая Калумбія (1821). Але ў 1822 была далучана да дзяржавы Гаіці. У 1844, у выніку паспяховага антыгаіцянскага паўстання, стала незалежнай, атрымала назву Д. Р. У 1861 Іспанія зноў завалодала тэрыторыяй Д. Р. У краіне разгарнулася барацьба за незалежнасць, і ў 1865 іспанцы пакінулі Д. Р. З сярэдзіны 19 ст. ў Д. Р. пачаў пранікаць замежны капітал. У 1905 ЗША ўсталявалі свой кантроль над таможнямі Д. Р. (існаваў да 1940), што палегчыла ўмяшанне ЗША ў паліт. жыццё краіны. У крас. 1916 у Д. Р. выбухнула паўстанне. Амер. войскі акупавалі краіну. Ваен.-акупац. рэжым дзейнічаў да 1924. У гэты перыяд амер. капітал яшчэ больш умацаваў свае пазіцыі. У маі 1930 да ўлады прыйшоў Р. Трухільё, прадстаўнік буйных памешчыкаў і буржуазіі, звязаных з ЗША. Новы прэзідэнт усталяваў рэжым крывавага паліт. тэрору. У 1944 створана партыя камуністаў — Дамініканская рэвалюц.-дэмакр. партыя (з 1946 Дамініканская народна-сацыяліст. партыя, з 1965 Дамініканская камуніст. партыя). Пасля 2-й сусв. вайны ва ўмовах уздыму нац.-вызв. барацьбы ў Лат. Амерыцы ўзмацнілася барацьба супраць рэжыму Трухільё. У маі 1961 Трухільё быў забіты. У снеж. 1962 адбыліся ўсеагульныя выбары. Перамогу атрымаў Х. Бош. Яго ўрад у крас. 1963 прыняў канстытуцыю, якая абвясціла агр. рэформу, шэраг паліт. і дэмакр. свабод, ажыццявіў мерапрыемствы па ўмацаванні нац. эканомікі і аслабленні залежнасці ад ЗША. У вер. 1963 рэакц. ваеншчына пры падтрымцы Пентагона і ЦРУ скінула ўрад Боша. Уладу захапіла хунта-трыумвірат. Было абвешчана надзвычайнае становішча, забаронены ўсе дэмакр. партыі, прагрэс. друк, разгромлены прафсаюзы. Нар. паўстанне ў крас. 1965 скінула хунту. Канстытуцыйны ўрад узначаліў Ф. Кааманьё. ЗША высадзілі ў Д. Р. 42 тыс. парашутыстаў і салдатаў марской пяхоты. Урад Кааманьё быў скінуты, часовым прэзідэнтам назначаны Г. Гадой. На выбарах у чэрв. 1966, якія адбываліся ва ўмовах ваен. акупацыі краіны т. зв. «міжамерыканскімі ўзброенымі сіламі», перамог стаўленік ЗША Х. Балагер. У 1966 ЗША вывелі свае войскі з тэр. Д. Р. Урад Балагера праводзіў рэпрэсіі супраць дэмакр. сіл і легальнай бурж. апазіцыі. Дамініканская камуніст. партыя і легальная апазіцыя заклікалі ўсе прагрэс. сілы аб'яднацца, каб скінуць контррэвалюц. рэжым. Аднак рэакцыя дамаглася ў 1970 перавыбрання Балагера прэзідэнтам на другі тэрмін.

Гаспадарка. Д. Р.— адсталая агр. краіна. Пад кантролем амер. манаполій ЗША вытворчасць цукру, здабыча баксітаў, а таксама большасць бананавых плантацый. У с. гасп. занята каля 70% самадзейнага насельніцтва. Характэрны буйныя латыфундыі і дробныя сялянскія гасп. Апрацоўваецца каля ½ ворных зямель. Вырошчваюць экспартныя культуры (тыс. *т*, 1968): цукр. трыснёг (вытв. цукру — 700), какаву-боб — 31, каву — 32,4, тытунь — 11,3, бананы, а на свае патрэбы кукурузу — 40, рыс — 169, маніёк, фасолю, бататы, манга і інш. Развіта жывёлагадоўля пашавага характару. У 1968 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 1100, свіней 1275, коней 255, коз 800, мулаў і аслоў 230. 40% прамысл. прадукцыі прыпадае на ачышчаны цукар. Здабываюцца баксіты (1 млн. *т*, 1968), жал. руда, гіпс, спажыўная соль. Вытв. электраэнергіі 701 млн. *квт·гадз* (1968). Прамысловасць харчовая, тэкстыльная (вытворчасць мешкавіны, канатаў), хімічная, буд. матэрыялаў. Знешнія перавозкі абслугоўваюцца марскім транспартам, унутраныя — аўтамабільным. Шашэйных дарог (1967) 8846 *км*, у т. л. 4325 *км* асфальтаваных; даўж. чыгунак 1770 *км*. Экспарт: цукар, кава, бананы, какава, тытунь, баксіты. Імпарт: бавоўняныя вырабы, харч. тавары, хімікаты, электраабсталяванне, нафтапрадукты. На долю ЗША прыпадае каля 88% экспарту і 55% імпарту. Грашовая адзінка — песа.

Асвета. У 1951 прыняты закон пра абавязковае навучанне дзяцей 7—14 гадоў, які фактычна не выконваецца. Каталіцкай царкве дазволена адкрываць у краіне школы любога тыпу. Вывучэнне рэлігіі ў школах абавязковае. Дашкольныя ўстановы для дзяцей 4—6 гадоў. Пач. школы 6-гадовыя ў гарадах, у сельскай мясцовасці пераважна 3-гадовыя. У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах і дзіцячых садах было 649 тыс. дзяцей. На базе 6-гадовай пач. школы 2-гадовая прамежкавая школа (1-я ступень ліцэя). Сярэднія школы — 4-гадовыя ліцэі. У 1967/68 навуч. г. ў прамежкавых школах і ліцэях займалася 76 тыс. вучняў. У 1967/68 навуч. г. ў сістэме прафесійна-тэхн. падрыхтоўкі навучалася 2,4 тыс. чал. Вышэйшую адукацыю дае ун-т у Санта-Дамінга. Музеі: Нац. музей, Нац. галерэя прыгожых мастацтваў; самая вялікая б-ка — пры ун-це.


ДАМІНІКАНЦЫ (лац. dominicani), манахі аднаго з каталіцкіх *жабрацкіх ордэнаў*, названага імем яго заснавальніка Дамініка (1170—1221). Ордэн створаны на Пд Францыі ў пач. 13 ст. ў перыяд *альбігойскіх войнаў* для барацьбы з нар. ерэтычным рухам. У барацьбе Д. карысталіся самымі жорсткімі сродкамі. З 1232 папства перадало ў іх рукі *інквізіцыю*. З дапамогай папства Д. захапілі багаслоўскія кафедры ва ўсіх ун-тах сярэдневяковай Еўропы. Пад сцягам місіянерства пранікалі ў многія краіны свету, актыўна спрыялі калан. захопам еўрапейцаў у Амерыцы, Акіяніі, на Д. Усходзе, імем бога апраўдвалі дзеянні каланізатараў. Ордэн мае (1970) каля 15 тыс. чл. больш як у 50 краінах.

У 1223 Д. заснавалі першы манастыр у Польшчы (Кракаў), зрабілі ля плацдармам для пранікнення на руска-беларуска-украінскія землі, каб падпарадкаваць іх уплыву папства. На тэр. Беларусі найб. актыўна дзейнічалі ў перыяд контррэфармацыі ў 17 ст., калі заснавалі манастыры ў Мінску, Гродне, Віцебску, Полацку, Брэсце, Пінску, Навагрудку, Друі, Ашмянах, Астраўцы, Нясвіжы, Оршы, Слоніме, Чашніках, Клецку, Ракаве, Рэчыцы, Стоўбцах, Шклове, Заслаўі, Дунілавічах, Мсціславе, Уле і інш. У Навагрудку ў 1654 засн. жаночы манастыр. Усяго на тэр. Беларусі існавала 42 манастыры Д. Пры манастырах былі школы.

Пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй уплыў Д. пачаў хутка слабець. Амаль усе манастыры закрыліся ў 1-й пал. 19 ст.

Дз. М. Мацяс. Мінск.

ДАМКРАТ (гал. dommekracht), пераносны або перасоўны механізм для падымання гру-



Тыпы дамкратаў: *1* — вінтавы на палазах; *2*, *5* — гідраўлічныя бесперапыннага дзеяння; *3* — гідраўлічны; *4* — рэечны з зубчастай перадачай; *6* — рычажна-рэечны; *7* — вінтавы (Мінскага трактарнага з-да); *8* — паравозны.

заў на невялікую (да 2 *м*) вышыню. Паводле прынцыпу дзеяння Д. падзяляюцца (гл. рыс.) на рычажна-рэечныя, рэечныя з зубчастымі перадачамі, вінтавыя і гідраўлічныя; паводле тыпу прывода — на ручныя і маторныя. Выкарыстоўваюцца на пагрузачна-разгрузачных,

мантажных і рамонтных работах, на чыг. і аўтамаб. транспарце.

«ДАМОКЛАЎ МЕЧ», выраз, які абазначае пастаянную небяспеку.

Паводле старажытнагрэч. паданняў прыбліжаны сіракузскага тырана Дыянісія Старэйшага (4 ст. да н. э.) Дамокл ліслівa называў Дыянісія самым шчаслівым з людзей. Дыянісій, хочучы паказаць яму петрываласць свайго шчасця, у час банкету пасадзіў Дамокла на сваё месца і павесіў над яго галавой на конскім воласе востры меч.

ДАМРАЧОЎ Аляксандр Васілевіч (н. 1904, в. Чусавая Пермскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). У Чырв. Арміі з 1929. На фронце з 1941, гвардыі палкоўнік, камандзір лёгка-артыл. брыгады. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. Брыгада Д. 16—18.10.1943 над варожым агнём фарсіравала Дняпро і каля в. Старое Лутава адбівала контратакі праціўніка, памагаючы пяхоце наступаць.

ДАНАТЭЛА (Donatello; сапр. Данато ды Нікало ды Бета Бардзі; 1386, Фларэнцыя — 13.12.1466), італьянскі скульптар. Адзін з выдатных майстроў Ранняга Адраджэння. Прадстаўнік фларэнцінскай школы. Праслякнутай ідэямі гуманізму, дэмакр. па духу творчасці Д. характэрныя смелае наватарства, мужнасць вобразаў (статуя св. Георгія для ц. Ор-Сан-Мікеле ў Фларэнцыі, 1416). У рэльефе «Баляванне Ірада» (каля 1423—27) для баптыстэрыя ў Сіене скульптар даў рэаліст. будову глыбокай прасторы. Плён вывучэння ант. помнікаў (каля 1432 у Рыме) відавочны ў статуі «Давід» (30-я г.; першая выява аголенага цела ў мастацтве Адраджэння), у рэльефах кафедры для неўчых фларэнтыйскага сабора (1430) і ў рэльефе «Благавешчанне» (каля 1435) у ц. Санта-Крочэ ў Фларэнцыі. Адзін з найб. значных твораў Д. — складаная кампазіцыя для алтара ц. Сант-Антоніо ў Падуі (40-я г.), на яго рэльефах упершыню ў час Адраджэння паказаны вял. масы людзей у рэальным жыццёвым асяроддзі. У Падуі Д. стварыў конны помнік кандацьеру Гатамелату (1447—53) — класічны ўзор гераічнага партрэта. Іл. гл. ў арт. *Італія*.



ДАНАЎ Васіль Іванавіч [н. 31.1(13.2).1913, в. Чарамшанка Барнаульскага пав. Тульскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1944. У 1931—39 настаўнік. У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну на Зах. фронце, абараняў Віцебск. У партызанах з кастр. 1941: камандзір спец. групы, узвода, атрада; з ліп. 1943 камісар *партызанскай брыгады імя А. В. Суворава* Вілейскай вобл. З чэрв. 1944 на парт. рабоце ў Смаргонскім р-не. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені, медалямі. Жыве ў с. Вылкава Алтайскага краю.

ДАНА́Я (Danáë), у ст.-грэч. міфалогіі дачка аргоскага цара Акрысія, якому прадказалі смерць ад унука.

Каб пазбегнуць гэтага, Акрысій замкнуў Д. ў падзямелле. Аднак Зеўс пранік да яе ў выглядзе залатога дажджу. Д. нарадзіла Персея, які потым незнарок забіў свайго дзеда. Міф пра Д. адлюстраваны ў карцінах Тыцыяна, Караджа, Рэмбранта і інш. мастакоў.

ДАНГЕ Шрыпад Амрыт (н. 10.10.1899), дзеяч індыйскага і міжнар. рабочага руху. Адзін з пачынальнікаў камуніст. руху і ветэран прафс. руху ў Індыі. З 1949 ген. сакратар Усеіндыйскага кангрэсу прафсаюзаў, віцэ-старшыня Сусв. федэрацыі прафсаюзаў. З 1943 чл. ЦК (з 1958 Нац. савета), з 1951 чл. Палітбюро ЦК (з 1958 Цэнтр. выканаўчага к-та) кампартыі Індыі (КПІ). У 1958—62 чл. Сакратарыята Нац. савета КПІ. З крас. 1962 старшыня Нацыянальнага савета КПІ. Няраз арыштоўваўся (прасядзеў у турмах больш за 15 гадоў). Аўтар прац па гісторыі і праблемах камуніст., рабочага і прафс. руху, першай у Індыі марксісцкай працы па стараж. гісторыі краіны. Узначальваў дэлегацыю КПІ на XXIII з'ездзе КПСС. Удзельнічаў у міжнар. Нарадзе камуніст. і рабочых партый 1969 у Маскве.

Тв.: Рус. пер.— Индия от первобытного коммунизма до разложения рабовладельческого строя, М., 1950.

ДАНЕЛАЙЦІС (Donelaitis) Крысціёнас (1.1.1714, в. Лаздзінеляй, Усх. Прусія — 18.2.1780), літоўскі паэт. З сялян. Скончыў Кёнігсбергскі ун-т (1740). Настаўнічаў. З 1743 пастар. Самы значны твор Д.— паэма «Чатыры пары года» (1765—75, апубл. 1818), дзе ён раскрыў вострыя сац. супярэчнасці свайго часу, рэалістычна паказаў побыт і падняволную працу літ. прыгонных сялян, услаviў чалавека-працаўніка. Пісаў байкі («Дуб-хвалько», «Воўк-суддзя» і інш.).



Тв.: Бел. пер.— Чатыры пары года, пер. А. Зарыцкага, Мн., 1961; рус. пер.— Времена года.— Басни, 3 изд., Л., 1960; Времена года, М., 1964.
Літ.: Довейка К. Кристионас Донелайтис, пер. с лит., Вильнюс, 1963; Семяжон Я. Вечны каляндар, «Полымя», 1961, № 11.

ДАНЕЛІЯ Пётр Аляксеевіч (н. 23.1.1920, Махачкала), беларускі савецкі жывапісец-пейзажыст. Вучыўся (у 1938—39) у Маск. маст. тэхнікуме памяці 1905 года. У 1939—45 у Сав. Арміі. З 1945 жыве ў Брэсце. Гал. тэма твораў Д.— прырода і гістар. мясціны Брэстчыны: «Балотная рэчка», «Сакавік» (абодва 1952), «Лістападаўскі вецер» (1956), «Плывуць аблокі», «Рака Мухавец» (абодва 1957), «Руіны Брэсцкай крэпасці», «Цярэспальскія вароты», «Каземат» (усе 1958), «Зімка» (1960), «Дарога» (1962), «Мая Брэстчына», «Па ўзгорках» (абодва 1968), «Курганы Леніпскіх Горак», «Свяшчэнная памяць» (абодва 1969). У Дзярж. маст. музеі БССР 9 карцін мастака.



П. А. Данелія. Па ўзгорках. 1968. Дзярж. маст. музей БССР.


ДАНЕЦ СЕВЕРСКІ (Паўночны), рака ў РСФСР і УССР, правы прыток Дона. Даўж. 1053 *км*. Пл. бас. 98,9 тыс. *км²*. Пачынаецца на паўд.-зах. схілах Сярэднерускага ўзв. У верхнім цячэнні (да Белгарада) перакрыты плацінамі і ўтварае рад сажалак. Даліна вузкая, у сярэднім цячэнні расшыраецца. У пойме многа старых рэчышчаў і балотаў. У нізоўі цячэ ў вузкай даліне ўздоўж паўн.-ўсх. ускраіны Данецкага кража. Гал. прытокі злева — Аскол, Калітва. Жыўленне пераважна снегавое. Ледастаў з пач. снеж. да 2-й пал. сакавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 190 *м³/сек*. Суднаходная ад вусця на 222 *км*. Выкарыстоўваецца для водазабеспячэння (канал Северскі Данец — Данбас). На Д. С. гарады Белгарад, Ізюм, Лісічанск, Каменск-Шахцінскі.

ДАНЕЦК (да 1924 Юзаўка, з 1924 да 1961 Сталіна), горад, цэнтр Данецкай вобл. УССР, на р. Кальміус. Узнік у 1869 як рабочы пасёлак. Чыг. станцыя, вузел шашэйных дарог, аэрапорт. 879 тыс. ж. (1970). Адзін з цэнтраў металургічнай, вугальнай, маш.-буд. і хім. прамысловасці. Больш за 200 прамысл. прадпрыемстваў. Найбольшыя з-ды: металургічны, коксахім., маш.-буд., металаканструкцый, ліцейна-мех., горнага абсталявання. Прамысловасць буд. матэрыялаў, лёгкая і харчовая. 6 ВНУ (у т. л. універсітэт), 18 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры, 3 музеі.

ДАНЕЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ (да 1961 Сталінская), у складзе УССР. Утворана 3.6.1938. Размешчана на ПдУ рэспублікі. Пл. 26,5 тыс. *км²*. Нас. 4894 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 18 раёнаў; 49 гарадоў, 139 гар. пас. Цэнтр г. Данецк.

Паверхня — хвалістая раўніна. На ПнУ — Данецкі кряж (выш. да 240 *м*), на З — Прыдняпроўская нізіна, на ПдЗ — Прыазоўскае ўзв., якое на Пд паступова пераходзіць у вузкую прыморскую нізіну. Карысныя выкапні: каменны вугаль (у межах вобласці частка Данецкага кам.-вуг. басейна), каменная соль, ртуць, флюсавыя і буд. вапнякі, даламіты, мергель, гіпс, трэпел, вогнетрывалыя і пластычныя гліны, кварцавы пясок, мел і інш. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад −7,8 на ПнУ да −5,4 °С на Пд, ліп. адпаведна 20,8, 22,8 °С. Ападкаў 450—500 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Рэкі: Северскі Данец з прытокам Кавённы Тарэц (бас. Дона); Самара, Воўчая (бас. Дняпра); Кальміус, Крынка, Кальчык (бас. Азоўскага м.). Глебы — чарназёмы рознага тыпу. Расліннасць стэпавая, на Данецкім кражы лесастэпавая. Пад лесам, хмызнякамі і лесапасадкамі 6,3% тэр. Насельніцтва: украінцы (53,1%), рускія (40,6%), грэкі (1,9%), беларусы (1,6%) і інш. Сярэдняя шчыльн. 184,7 чал. на 1 *км²*. Гарадскога нас. 87%. Найб. гарады: Данецк, Макееўка, Жданаў, Горлаўка, Краматорск.

Аб'ём валавой прадукцыі прамысловасці ў 1970 павялічыўся ў параўнанні з 1940 у 5,4 раза. Аснова эканомікі — вугальная, металург. і маш.-буд. прамысловасць. У 1970 здабыта 106,8 млн. *т* вугалю. Металург. прамысловасць працуе на мясцовым коксе, крыварожскай і керчанскай рудзе і нікапальскім марганцы. Металург. з-ды з поўным металург. цыклам у Данецку, Жданаве, Янакіеве, Макееўцы, Краматорску, Канстанцінаўцы. Ртутны камбінат у Горлаўцы, цынкавы з-д у Канстанцінаўцы, з-д каляровых металаў у Арцёмаўску. Машынабудаванне і металаапрацоўка (маш.-буд. з-д імя Кірава ў Горлаўцы, цяжкага машынабудавання і станкабудавання ў Краматорску, цяжкага машынабудавання ў Жданаве, маш.-буд. з-ды ў Дзябальцаве, Данецку, Тарэзе, Ясінаватай). Вырабляецца металург. абсталяванне, вугальныя камбайны, цяжкія прэсы, станкі і механізмы. На базе вугальнай і металург. прамысловасці развілася хім. і коксахім. прамысловасць, асабліва вытворчасць кіслот, азотных угнаенняў, смолаў і інш. Найбольшыя коксахім. з-ды ў Горлаўцы, Данецку, Жданаве, Макееўцы, Аўдзееўцы. Хім. камбінат у Горлаўцы, хім. з-д у Канстанцінаўцы, содавы камбінат у Славянску, з-д хім. рэактываў у Данецку. Прамысловасць буд. матэрыялаў: цэментная (камбінат у Амвросіеўцы, з-ды ў Краматорску, Янакіеве), вытворчасць зборнага жалезабетону, шыферу, мінер. ваты, вогнетрывалых матэрыялаў, цэглы, шкларобная (вытворчасць аконнага і тэхн. шкла, шклянога посуду ў Канстанцінаўцы, Арцёмаўску і інш.). У Славянску ф-ка алоўкаў. Харч. прамысловасць пераважна мясная (8 мясакамбінатаў), малочная, піваварная, рыбная (камбінат у Жданаве). Лёгкая прамысловасць (абутковая, тэкст., трыкатажная, швейная). Асн. цэнтры: Данецк, Жданаў, Макееўка, Арцёмаўск, Краматорск. Мэблевая прамысловасць. Энергетыка вобласці грунтуецца на мясц. вугалі і прывазной нафце. Зуеўская, Старабешаўская, Славянская, Курахоўская, Міронаўская і інш. ДРЭС разам з эл. станцыямі Варашылаў-



ДАНЕЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ — Маштаб 1:2 000 000

градскай вобл. аб'яднаны ў сістэму «Данбасэнерга», якая лініямі высакавольтавых перадач звязана з энергасістэмай Дняпра і Волгі.

Вакол прамысл. цэнтраў развіта агародніцтва і малочна-мясная жывёлагадоўля, на Пд і З мяса-малочная жывёлагадоўля і вырошчванне збожжа. У Д. в. 307 калгасаў і 131 саўгас (1971). Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 1582,5, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 774,1, тэхн. 170,1; асн. збожжавыя культуры: кукуруза — 193,6, ячмень — 227,2, пшаніца — 262,6; з тэхн. сланечнік — 169,5. Сеюць цукр. буракі, шматгадовыя травы. Садоўніцтва і вінаградарства. На 1.1.1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 1028,3 (у т. л. кароў 409,6), свіней 1002,7, авечак і коз 268,9. У Д. в. самая густая ў СССР чыг. сетка (58 *км* на 1000 *км*²). Даўж. чыгунак 1618 *км*, з іх 845 *км* электрыфікаваны (1969). Найб. чыг. вузлы: Ясінаватая, Красны Ліман, Дзябальцава, Мікітаўка, Ілавайск, Валнаваха. Аўтамаб. дарог з цвёрдым пакрыццём 4,9 тыс. *км* (1969). Марскі порт Ждановы. Аэрапорты ў Данецку і Ждановым. 9 ВНУ (у т. л. ун-т), 81 сярэдняя спец. навуч. ўстанова, 4 тэатры, 6 музеяў. Абл. газеты: «Радянська Донеччина», «Социалистический Донбасс».

ДАНЕЦКІ КРАЖ, узвышша ва ўсх. частцы УССР і на З Растоўскай вобл. РСФСР. Пераважаюць выш. 200—300 *м*, найвыш. пункт г. Магіла-Мячэтная (367 *м*).

Складзены з сланцаў, пясчанікаў, вапнякоў палеазойскага і мезазойскага ўзросту. У пародах кам.-вуг. адкладаў шматлікія праслоі кам. вугалю. Рэльеф пераважна ўваліста-хвалісты, на ўскраінах платопадобны. Паверхня парэзана далінамі рэк і яроў. Карысныя выкапні: кам. вугаль, ртуць, соль, вогнетрывалыя гліны. Узвышаныя ўчасткі месцамі заняты масівамі лясоў з дубу, ясеню, клёну і ліпы; ніжняя ч. схілаў разарана.

ДАНЕЦКІ УНІВЕРСІТЭТ, вышэйшая навуч. ўстанова. Засн. ў 1965 у г. Данецку на базе Данецкага пед. ін-та. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: матэм., фіз., хім., біял., філал., гістар., эканам.; завочны (у г. Горлаўка). Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае. Есць аспірантура. Пры ун-це б-ка, музеі: археалагічны, этнаграфіі, гісторыі ун-та, заалагічны. Ун-т прымае да абароны канд. і докт. дысертацый.

ДАНЖОН (фр. donjon), галоўная вежа феадальнага *замка*, якая служыла месцам апошняй абароны і ўкрыццём пры нападзе ворага. Мела памяшканні для жылля, запасаў правіянту і інш.

ДАНІЛА ГАЛІЦКІ (1201—64), князь галіцкі і валынскі, сын Рамана Мсціславіча. З 1211 князь у Галічы, у 1212 выгнаны, з 1221 на Валыні. У 1229 закончыў аб'яднанне валынскіх зямель. У княства ўваходзілі гарады Бярэсце (Брэст), Кобрын, Камянец, Бельск, Драгічын; ад яго залежалі пінскія і тураўскія князі. У 1223 удзельнічаў у бітве на р. Калка супраць мангола-татар, у 1237 супраць Тэўтонскага ордэна (разбіў крыжакоў каля Драгічына Надбужскага). У 1238 авалодаў Галічам, у 1239 Кіевам, заснаваў г. Львоў, Холм, Угровеск, Данілаў і інш. Сталіцай княства зрабіў Холм.Ваяваў з Польшчай і Венгрыяй (1245), з літ. феадаламі, яцвягаў прымусіў плаціць даніну. Сын Д. Г. Раман атрымаў ад вял. князя літ. Міндоўга Чорную Русь з Ваўкавыскім, Свіслацкім і Навагрудскім княствамі. Каб стварыць у Еўропе кааліцыю для барацьбы з мангола-татарамі, у 1254 прыняў ад рымскага папы каралеўскі тытул, але выступаў супраць пашырэння каталіцтва. У 1259 вымушаны прызнаць залежнасць ад татар і ў 1260—61 знішчыць гарадскія ўмацаванні ў княстве. У княжанне Д. Г. Галіцка-Валынскія землі дасягнулі значнага эканам. і паліт. росквіту.

Літ.: Дашкевич Н. Княжение Даниила Галицкого по русским и иностранным известиям, Киев, 1873; Пашуто В. Т. Очерки по истории Галицко-Волынской Руси, М., 1950.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ДАНІЛАВІЧЫ, вёска ў Веткаўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Лебедзева. За 20 *км* на ПнЗ ад Веткі, 28 *км* ад Гомеля, 13 *км* ад чыг. ст. Касцюкоўка. 573 ж., двароў 186 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік І. С. *Лебедзеву*, селькору, сакратару камсамольскай ячэйкі, якога забілі кулакі ў 1924. Калгасу і школе прысвоена яго імя. На брацкай магіле помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАНІЛАВІЧЫ, вёска ў Дабрынёўскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл., на р. Жэсць. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 20 *км* на ПдУ ад Дзяржынска, 56 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Койданава. 544 ж., гасп. 179 (1971). Сярэдняя школа, клуб, магазін. Помнік 85 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДАНІЛАВІЧЫ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Наваельненскі». За 18 *км* на У ад Дзятлава, 152 *км* ад Гродна, 5 *км* ад чыг. ст. Наваельня, каля аўтамаб. дарогі г. п. Наваельня — в. Валеўка (2 *км*). 503 ж., гасп. 177 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 26 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДАНІЛАВЫ, беларускія савецкія архітэктары.

Аляксандра Юр'еўна (н. 26.3.1927, г. Гадзяч Роменскай акр.). Засл. арх. БССР (1970). З 1951, пасля заканчэння Кіеўскага інж.-будаўнічага ін-та, у Віцебску (з 1969 кіраўнік арх.-планіровачнай майстэрні). З работ: будынкі прафтэхвучылішча на вул. Кірава і шэраг жылых дамоў у Віцебску. Адна з аўтараў генпланаў Віцебска, Полацка, Наваполацка, Оршы, праектаў забудовы вул. Кірава і Фрунзе, мікрараёна на вул. Праўды ў Віцебску, 4-га мікрараёна ў Наваполацку.

Віталь Аляксандравіч (н. 7.4.1923, г. Кохма Іванава-Вазнясенскай губ.). Пасля заканчэння ў 1951 Кіеўскага інж.-будаўнічага ін-та працуе ў Віцебску (з 1968 гал. арх. Віцебскага філіяла Белдзяржпраекта). Шэраг работ у Віцебску выкананы разам з А. Ю. Данілавай і інш. архітэктарамі: рэканструкцыя вул. Леніна і Кірава (1952—60, з В. Гусевым), генплан (1966, з В. Чарнышовым і Л. Эйнгорнам), праекты забудовы цэнтр. і паўд. жылых раёнаў. Распрацаваў праекты комплексу мед. ін-та, дэталёвай планіроўкі мікрараёна па Смаленскай шашы, гасцініцы «Дзвіна» ў Віцебску, генплан Новалукомля (з арх. З. Даўгяла) і інш.

М. Б. Марцінкоўскі. Мінск.

ДАНІЛАЎ Аляксей Дзмітрыевіч (1907, в. Ужга Усцсысольскага пав. Валагодскай губ.— 13.1.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1942. Вызначыўся ў бітве за Дняпро ў вер. 1943 на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. Удзельнічаў у рукапашным баі за плацдарм, адбіваў варожыя контратакі. Пахаваны ў Калінкавічах.

ДАНІЛАЎ Аляксей Ільіч (19.1.1923, в. Капцёва Сычоўскага пав. Смаленскай губ.— 30.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1943. Вызначыўся 30.6.1944 пры вызваленні Барысава. Танк з экіпажам у складзе П. М. *Рака*, А. А. *Пятраева* і Д. прарваўся ў заняты ворагам горад і 17 гадзін вёў бой. Да апошняй хвіліны жыцця Д. дакладваў па радыё пра размяшчэнне агнявых кропак і танкаў праціўніка. У Барысаве экіпажу танка пастаўлены помнік.

ДАНІЛАЎ Андрэй Сцяпанавіч [н. 4(17).11. 1910, в. Вяжля Аткарскага пав. Саратаўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Чл. КПСС з 1935. У Чырв. Арміі з 1930. Лётчык-знішчальнік. 22.6.1941 у паветр. баі каля Гродна капітан Д. збіў 3 варожыя самалёты, адзін з іх тараніў. Камандаваў авіяпалком, удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях на тэр. Германіі. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Ганаровы грамадзянін Гродна. Жыве ў Аткарску Саратаўскай вобл.

ДАНІЛАЎ Міхаіл Іванавіч [23.11(6.12).1911, в. Туруноўка Каінскага пав. Томскай губ.— 19.4.1945], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. 23.6.1944 узвод на чале з Д. авалодаў вышынёй у Дрыбінскім раёне, 24.6.1944 у баях каля в. Жовань і Чэрнеўка прычыніў вялікія страты ворагу, фарсіраваў р. Басю, Дняпро і замацаваўся на плацдарме. Загінуў у баі на тэр. Германіі.

ДАНІЛАЎ Павел Аўрамавіч [н. 1(13).11.1897, в. Красноўка Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі рэжысёр, акцёр і драматург. Засл. дз. маст. БССР (1961). Скончыў Ленінградскі ін-т сцэн. мастацтваў (1926, педагог Л. Віўен). У 1930—36 у БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы). Паставіў спектаклі: «Мядзведзь» А. Чэхава і «Агаціна цялушка» Д. (1933), «Сваты» І. Гурскага (1936), з Л. Літвінавым «Недарасль» Дз. Фанвізіна (1933) і «Сімфонія гневу» В. Шашалевіча (1934). Маст. кіраўнік Барысаўскага, Заслаўскага калг.-саўг. т-раў, Пінскага абл. драм. т-ра (1936—41). З пастановак: «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Сваты». У 1947 — 63 гал. рэж. на

Бел. радыё. Аўтар п'ес «Лявоніха» (паст. ў 1960 т-рам імя Я. Коласа), «Дзівосы на калёсах» (1961) і інш. *С. А. Пятровіч.* Мінск.

ДАНІЛАЎ Пётр Аляксеевіч (1915, в. Малая Агароўка Тульскага пав.— люты 1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1937. Чл. КПСС. Вызначыўся ў лютым 1944 у наступальнай аперацыі паміж Рагачовам і Жлобінам. Фарсіраваў Дняпро, на захопленым плацдарме падняў байцоў у атаку. Загінуў у баі. Пахаваны ў в. Доўск Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ДАНІЛЕВІЧ Васіль Яўхімавіч (1872, Курск — 16.11.1936), укр. сав. гісторык і археолаг. Скончыў Кіеўскі ун-т. З 1902 праф. Харкаўскага, з 1907 Кіеўскага ун-таў, удзельнік стварэння Кіеўскага археал. музея. Вывучаў гісторыю Паўн. Беларусі і Слабодскай Украіны 17 ст., вёў археал. раскопкі на Беларусі і Украіне, даследаваў неаліт. стаянку ў в. Кісцяні Рагачоўскага пав. Аўтар прац па нумізматыцы, сфрагістыцы, этнаграфіі, фальклоры.

Тв.: Стоянка и мастерская каменного века в Могилевской губ., исследованная летом 1893 г., «Киевская старина», 1895, т. 49, апрель; Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV столетия, Киев, 1896; Пути сообщения Полоцкой земли до конца XIV ст., Юрьев, 1898.

Літ.: Козловская В. Я. Памяти проф. В. Е. Данилевича, «Советская археология», 1937, т. 4. *Л. В. Аляксееў.* Масква.

ДАНІЛЕНКА Міхась (Міхаіл Пятровіч; н. 28.10.1922, в. Ястрабка Рэчыцкага пав. Гомельскай губ.), беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Скончыў Гомельскі наст. ін-т (1952). Удзельнік Айч. вайны. Пасля вайны настаўнічаў. З 1954 у рэдакцыі газ. «Гомельская праўда». Друкуецца з 1940. Першы аб. апавяд. «Мая песня» (1952). Кыццё калг. вёскі, школы, высакародная праца настаўнікаў — асн. тэмы твораў Д.

Тв.: Вернасць слову, Мн., 1956; Майская навальніца, Мн., 1959; Зачараваны гарлачык, Мн., 1961; На вуліцы Сонечнай, Мн., 1963; Наваселле, Мн., 1964; Наш дом, Мн., 1971.

Літ.: Нікіфаровіч В. Пра нашых сучаснікаў, «Маладосць», 1960, № 3; Гусак С. Размова з малымі, там жа, 1961, № 10.

ДАНІЛІЦКІ Антон Пятровіч (н. 1.1.1922, в. Бобрыкі Мазырскага пав. Мінскай губ.), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Бабруйскі тэхнікум мех. апрацоўкі дрэва (1940), танк. вучылішча (1944). У Чырв. Арміі з 1940. У Айч. вайну ўдзельнік вызвалення Украіны і Польшчы, Берлінскай і Пражскай аперацый.



Вызначыўся ў Львоўска-Сандамірскай аперацыі. 14.7.1944 пры прарыве варожай абароны танк Д. першы ўварваўся ў нас. пункт Нушчу, гэтым садзейнічаў поспеху бою; 15.7.1944 на чыг. вузле Краснае адрэзаў шлях пям. эшалонам; у баях за Львоў перагарадзіў ворагу дарогу для адступления; 18.8.1944 на левым беразе Віслы ў баі за плацдарм адбіў 6 контратак. Служыць у Сав. Арміі.

ДАНІЛОВІЧ Алена Мікалаеўна [27.4(10.5). 1906, Рязань — 8.11.1957], руская і беларуская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1955). Чл. КПСС з 1942. У 1923 пачала творчую дзейнасць у тэатр. студыі (г. Уладзімір). Працавала ў т-рах Кастромы, Мурама, Разані, Крывога Рога (1925—34, 1941—43). З 1934 у БДТ-3, з 1937 у Палескім т-ры. У 1943—45 супрацоўнік Упраўлення па справах маст. БССР у Маскве, потым у Мінску, у 1945—46 дырэктар Брэсцкага т-ра імя ЛКСМБ. З 1946 актрыса Палескага т-ра імя Я. Купалы, з 1954 — Магілёўскага драм. т-ра. Характарная актрыса. З роляў: Васа («Васа Жалязнова» М. Горкага), Гурмыжская («Лес» А. Астроўскага), Ганна Андрэеўна («Рэвізор» М. Гогаля), пані Яндрыхоўская («Партызаны» К. Крапівы), Франя («Калі зацвітаюць сады» В. Палескага).

А. М. Кашына. Магілёў.

ДАНІЛОВІЧ Валянцін Іванавіч (15.2.1936, в. Калодзішчы Смалявіцкага р-на — 20.5.1970), выпрабавальнік парашутаў і катапультных сістэм, майстар спорту СССР па парашутным спорце (1958). Чл. КПСС з 1966. Скончыў Маск. авіяц. ін-т (1961). З 1965 у Сав. Арміі. Шматразовы рэкардсмен свету (1958, 1962—тройчы) і Сав. Саюза (1957, 1962) па скачках з парашутам. Загінуў пры выпрабавальным катапультаванні. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі.

ДАНІЛОВІЧ Ігнат Мікалаевіч [30.7(10.8). 1788, в. Грынявічы Бельскага пав. Падляскага ваяводства — 30.6(12.7).1843], ліберальна-бурж. гісторык права Вял. кн. Літ.; адзін з першых даследчыкаў заканадаўчых і летапісных помнікаў Беларусі. Праф. грамадз. і крымін. права (1823). З сям'і уніяцкага святчэнніка. Скончыў Віленскі ун-т. З 1814 выкладаў права ў ун-тах Вільні, Харкава, Кіева, Масквы. У 1830—35 працаваў у камісіі М. М. Спяранскага па складанні збору мясцовых законаў зах. губерняў. Выявіў і выдаў рукапісы Супрасльскага летапісу («Летапісец Літвы і руская хроніка», 1827) і Статута 1529 («Збор літоўскіх законаў...», 1841). На аснове яго матэрыялаў складзены «Агляд гістарычных звестак аб складанні збору мясцовых законаў заходніх губерняў», 1837, 2 выд. 1910. У «Скарбніцы грамат...» («Skarbiec dyplomatów...», т. 1—2, 1860—62) апісаў (падаючы месца знаходжання) і пераказаў змест каля 2500 сабраных ім крыніц па гісторыі Беларусі і Літвы ад выпісак з Геродота да актаў 1569. Удзельнічаў у выданні «Кнігі пасольскай Метрыкі Вялікага княства Літоўскага...» (т. 1, 1843).

Тв.: О Литовском статуте, «Журнал Министерства народного просвещения», 1838, ч. 17, № 2; О литовских летописях, там жа, 1840, [№ 11]; Взгляд на литовское законодательство и Литовские статуты, у кн.: Юридические записки, издаваемые П. Редкиным, т. 1, М., 1841.

Літ.: Владимирский-Буданов М. Ф. Данилович И. Н., у кн.: Биографический словарь профессоров и преподавателей имп. ун-та св. Владимира (1834—1884), Киев, 1884; Daniłowicz Ignacy, У кн.: Janowski L. Słownik bio-bibliograficzny dawnego Uniwersytetu Wileńskiego, Wilno, 1939.

М. Ф. Спірыдонаў. Мінск.

ДАНІЛЬЯНЦ Ерамей Іванавіч [22.4(5.5). 1901, с. Мірзаполь Шушынскага пав. Елізаветпольскай губ.— 28.10.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1924. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У ноч на 28.9.1943 кулямётны разлік на чале з Д. фарсіраваў Дняпро. У баі за плацдарм каля в. Вяле і Галкі Д. заглушыў 2 кулямётныя кропкі і прычыніў ворагу страты ў жывой сіле. Загінуў у баі.

ДАНІЛЮК Леанід Сямёнавіч (н. 3.5.1919, в. Студзёнка Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1939), Тбіліскае артыл. вучылішча (1941). У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну на Паўн.-Зах., 2-м Укр. і 1-м Бел. франтах. Самаходны артыл. полк на чале з Д. вызначыўся ў Берлінскай аперацыі. 18.4.1945 у баі за Бернаў полк атакаваў горад з флангаў. Упарадзе левай калоны Д. прыняў на сябе артыл. агонь ворага. Самаходная гармата была прабіта, але Д. прарваўся на ўскраіну горада, гэтым садзейнічаў поспеху наступлення корпуса. Служыць у Сав. Арміі.



ДАНІЛЮК Святлана Піліпаўна (н. 25.9.1939, Кіеў), беларуская савецкая спявачка (мецца-сапрана). Засл. арт. БССР (1968). Скончыла Кіеўскую кансерваторыю (1963). Да 1966 салістка Пермскага т-ра оперы і балета, з 1966— Бел. т-ра оперы і балета. З партый: Алеся («Алеся» Я. Цікоцкага), Вераніка («Зорка Венера» Ю. Семяпякі), Маша («Брэсцкая крэпасць» К. Малчанава), Марфа («Хаваншчына» М. Мусаргскага), Любаша («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ), Амперыс («Аіда» Дж. Вердзі). Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў імя Глінкі (1965; 2-я прэмія). Выступала ў Польшчы, ЧССР, Францыі.

ДАНІЦЭЦІ (Donizetti) Гаэтана (29.11.1797, Бергама — 8.4.1848), італьянскі кампазітар. Праф. і дырэктар кансерваторыі ў Неапалі (1834—39). Майстар вак. стылю бельканта, пісаў оперы ў розных жанрах. Лепшыя — камічныя — звязаны з нац. оперными традыцыямі, італьян. нар. музыкай. З опер (усяго каля 70): «Любоўны напітак» (1832, паст. ў Бел. т-ры оперы і балета ў 1965), «Лукрэцыя Борджа» (1833), «Лючыя ды Ламермур» (1835), «Дачка палка» і «Фаварытка» (абедзве 1840), «Дон Паскуале» (1843).

ДАНІЭЛЬСОН Мікалай Францавіч (псеўд. Нікалай-он; 1844—3.7.1918), рускі сацыёлаг і публіцыст, прадстаўнік ліберальнага народніцтва. Удзельнічаў у перакладзе 1-га т. «Капітала» К. Маркса (выйшаў у 1872), першы самастойна пераклаў на рус. мову 2-і (1885) і 3-і т. (1896). Перапісваўся з К. Марксам і Ф. Энгельсам, аднак сутнасці марксізма не зразумеў. Кніга Д. «Нарысы нашай парэформенай грамадскай гаспадаркі» (1893) стала эканам. платформай *народніцтва.*

Літ.: Ленін У. І. Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве, Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); Уроева А. В. Книга, жившая в веках, М., 1967.

ДАНІЯ (Danmark), Каралеўства Данія, дзяржава ў Зах. Еўропе. Размешчана на п-ве Ютландыя, а-вах Зеландыя, Фюн, Лолан, Фальстэр, Мён і інш., а таксама на в-ве Борнхальм. Пл. 43 тыс. км². Нас. 4,9 млн. чал. (1970). Сталіца Капенгаген. Падзяляецца на 25 амтаў. Д. належаць в-аў *Грэнландыя* і Фарэрскія а-вы (1,4 тыс. км², 38 тыс. чал., 1969). Іл. гл. на ўкл.




Дзяржаўны лад. Канстытуцыйная манархія. Дзейнічае канстытуцыя 1953. На чале дзяржавы кароль. Заканадаўчую ўладу ажыццяўляе кароль (фармальна) і аднапалатны парламент (фолькетынг). Парламент выбіраецца на 4 гады. Урад узначальвае прэм'ер-міністр.

Прырода. На З Д. абмываецца Паўночным м., на У — Балтыйскім. Даўж. берагавой лініі 7438 км. Зах. і паўн.-ўсх. ўзбярэжжы выраўненыя, з-за водмеляў цяжкадаступныя суднам; на У шмат валіваў і праліваў (Вял. і Малы Бельт, Эрэсун і інш.). Амаль уся паверхня Д.— хвалістая нізіна, складзеная з асадкавых парод. На У п-ва Ютландыя найвыш. пункт Д.— г. Аер-Баўнехай (172 м). На в-ве Борнхальм на паверхню выходзяць крышталічныя пароды. Невял. запасы цементавай сыравіны, кааліну, кам. і калійнай солі, бурага вугалю. Клімат умераны, марскі. Сярэдняя т-ра студз. ад 0 да −1, ліп. 15, 17 °С. Ападкаў 750—800 мм на З, 550—600 мм на У за год. Частыя туманы. Самая вялікая рака Гудэна (158 км). Многа азёраў, асабліва на У Ютландыі і на П-ве Зеландыі. Пераважаюць дзярнова-падзолістыя глебы, месцамі бурыя лясныя. 70% тэр. занята с.-г. ўгоддзямі; пад лесам 11%. На З Ютландыі саджаныя хвойныя (хвоя, елка), ва ўсх. раёнах Д. шыракалістыя лясы (бук, дуб). Невял. масівы верашчатнікаў і балотаў.

Насельніцтва. Датчан больш за 98%. Афіц. мова дацкая. Сярод веруючых пераважаюць лютэране. Сярэдняя шчыльн. 114 чал. на 1 км². ²/₃ насельніцтва гарадское, у т. л. каля ¹/₃ жыве ў «Вялікім Капенгагене» (1,4 млн. ж., 1969). Самыя вялікія гарады: Капенгаген (870 тыс. ж., 1969), Орхус (113 тыс. ж., 1968), Одэнсе (104,4 тыс. ж.), Ольбарг, Эсб'ерг.

Гістарычны нарыс. У старажытнасці тэр. Д. была заселена герм. плямёнамі (кімвры, тэўтоны, юты, англы, саксы); у 5—6 ст. з Паўд. Швецыі ўварваліся даны. У 6—8 ст. адбываўся распад першабытнаабшчыннага ладу, умацавалася ўлада ваен. важакоў. У 9—10 ст. дружыны дацкіх вікінгаў захапілі большую частку Англіі і заснавалі ў 911 у вусці р. Сена Нармандскае герцагства. У гады праўлення караля Горма Старога (п. каля 950) склалася раннефеад. дацкая дзяржава. Пры Кнудзе Вялікім (1018—35) дацкія феадалы падпарадкавалі сабе Англію і Нарвегію (пасля смерці яго англа-дацка-нарвежская дзяржава распалася). У 2-й пал. 12 — пач. 13 ст. Д. заваявала паўд. і частку ўсх. ўзбярэжжа Балтыйскага м. (пасля бітвы 1227 з ням. феадаламі пры Борнхёведзе б. ч. гэтых тэр. страчана). Вайна 1367—70 з ням. гандл. саюзам *Ганзай* за панаванне на Балтыйскім м. скончылася паражэннем Д. У 1397—1523 пад уладай дацкіх каралёў аб'ядналіся Швецыя (з Фінляндыяй) і




Нарвегія (з Ісландыяй). У 1460 заключана асабістая унія з Шлезвіг-Гольштэйнам. На той час у Д. ўсталяваліся феад.-прыгонніцкія адносіны. У 1523 з-пад дацкага панавання вызвалілася Швецыя. У 2-й пал. 16 ст. Д. дамагалася перавагі на Балтыйскім м., у барацьбе з *Лівонскім ордэнам* і Швецыяй часта апіралася на саюз з Рускай дзяржавой. У *Трыццацігадовай вайне 1618—48* зазнала некалькі цяжкіх паражэнняў і ў выніку наступных няўдалых войнаў страціла ўсе ўладанні на а-вах Балтыйскага м. і на Пд Скандынаўскага п-ва. У 1616 захапіла Транкебар у Індыі, у 1671 частку Віргінскіх а-воў. У 17 ст. у краіне ўсталяваўся абсалютызм, палівіліся першыя мануфактуры. Сялянскія выступленні, якія асабліва ўзмацніліся ў канцы 80-х г. 18 ст., прывялі да ліквідацыі у 1788—1800 прыгону. У гарадах нараджалася гандл. і часткова прамысл. буржуазія. У выніку саюзу з Расіяй (сістэма дагавораў 1767—73) знешнепаліт. становішча Д. ўмацавалася, але з-за няўдалых войнаў, якія Д. вяла разам з Напалеонам I, ад яе паводле Кільскіх мірных дагавораў 1814 адышлі: да Швецыі Нарвегія, да Вялікабрытаніі в-аў Гельголанд. У перыяд рэвалюц. падзей 1848—49 дацкі кароль Фрэдэрык VII мусіў увесці (1849) канстытуцыю. Д. стала бурж.-памешчыцкай канстытуцыйнай манархіяй. Пасля *Дацкай вайны 1864* ад Д. адышлі да Аўстрыі і Прусіі: Шлезвіг, Гольштэйн і Лаўэнбург. Д. стала нацыянальна аднароднай краінай. У 1876 на базе створанай у 1871 дацкай секцыі 1-га Інтэрнацыянала сфарміравана С.-д. партыя Д. (СДПД). Палітыка яе кіраўнікоў мела рэфармісцкі, апартуністычны характар. У канцы 19 — пач. 20 ст. дацкі капіталізм уступіў у імперыялістычную стадыю развіцця, засн. буйныя манаполіст. аб'яднанні. Яны пачалі вывозіць капітал за мяжу, у прыватнасці ў Расію. У 1901 сфарміраваны першы адказны перад парламентам урад. У 1915 прынята буржуазна-дэмакр. канстытуцыя. Інтарэсы дацкай буржуазіі цесна перапляталіся з англ. і нямецкімі капіталамі. Гэта абумовіла нейтралітэт Д. у 1-й сусв. вайне, але не выратавала яе ад значнага скарачэння вытворчасці. У 1916 пад ціскам ЗША Д. прадала ім уладанні ў Вест-Індыі. Пад уплывам Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. ўзмацніўся ў 1917—20 масавы рух (забастоўкі, дэманстрацыі беспрацоўных, мітынгі; у рабочым руху абвастрылася барацьба супраць рэфармізму). У 1919 створана кампартыя Д. (КПД). У 1918 пад ціскам выз. барацьбы Д. прызнала Ісландыю суверэннай краінай у межах дацка-ісландскай уніі (афіц. спынена Ісландыяй у 1944). У выніку плебісцыту 1920 Д. была вернуты населены датчанамі Паўн. Шлезвіг. У 1924 с.-д. ўрад Д. прызнаў СССР дэ-юрэ і ўстанавіў з ім дыпламат. адносіны. У гады сусв. эканам. крызісу 1929—33 абвастрылася класавая барацьба, узмацніўся ўплыў КПД, у 1932 у парламент упершыню выбраны камуністы (2 чал.).

У 2-ю сусв. вайну Д. акупавалі (крас. 1940) ням.-фаш. войскі. Дацкі ўрад супрацоўнічаў з акупац. ўладамі, у чэрв. 1941 разарваў дыпламат. адносіны з СССР, у ліст. 1941 аднавіў пра далучэнне да *«Антыкамінтэрнаўскага пакта»*. З 1942 у краіне пачаўся Рух Супраціўлення, на ініцыятыве камуністаў створаны адзіны фронт супраць акупантаў. У жн. 1943 шмат у якіх гарадах адбыліся антыфаш. забастоўкі. 5.5.1945 ням.-фаш. войскі ў Д. капітулявалі перад англійскімі ўзброенымі сіламі і войскамі дацкага Супраціўлення. 9.5.1945 савецкія войскі вызвалілі в-аў Борнхальм. 16 мая адноўлены дыпламат. адносіны з СССР. З 1945 Д. чл. ААН. Пасля 2-й сусв. вайны Д. адмовілася ад палітыкі нейтралітэту, якой яна трымалася з 1864. У 1949 уступіла ў НАТО. У 1950 падпісала з ЗША пагадненне пра «ваен. дапамогу». 27.4.1951 ЗША дамагліся ад Д. заключэння дагавору пра «абарону Грэнландыі», які фактычна ўзаконіў акупацыю в-ва амер. войскамі. Д. адобрыла *Парыжскія пагадненні 1954*, якія аформілі ваен. саюз краін НАТО з ФРГ. 5. 6.1953 у Д. пачала дзейнічаць новая канстытуцыя (увяла аднапалатны парламент, дапускала перадачу часткі суверэнітэту краіны т. зв. міжнар. уладам, г. зн. фактычна НАТО). З 60-х г. 20 ст. у эканоміку Д. актыўна пранікае замежны капітал (пераважна амер., англ., заходнегерм., шведскі). У студз. 1960 Д. стала членам Еўрап. асацыяцыі свабоднага гандлю, створанай у тым жа годзе па ініцыятыве англ. і швед. прам.-гандл. колаў у процівагу «Агульнаму рынку». Урад Д. выступае за вырашэнне в'етнамскага пытання праз перагаворы. Д. далучылася да рэзалюцыі Савета Бяспекі ААН ад 22.11.1967 пра паліт. ўрэгуляванне блізкаўсходняга крызісу.



Расправа паліцыі над дэманстрантамі, якія пратэстуюць супраць прыбыцця ў Данію ваенных падраздзяленняў ФРГ для ўдзелу ў манеўрах НАТО. 1966.



Асноўныя палітычныя партыі і прафсаюзы. Партыі ўрадавай кааліцыі: Левая ліберальная партыя (да вер. 1963 Партыя Венстрэ), засн. ў 1870, выразніца інтарэсаў буйных і сярэдніх землеўладальнікаў; Кансерватыўная народная партыя, засн. ў 1915, партыя буйной фін.-прамысл. буржуазіі, памешчыкаў, тытулаванага дваранства; Радыкальная левая партыя, засн. ў 1905, выразніца інтарэсаў дробнай буржуазіі горада і вёскі, некат. часткі інтэлігенцыі. Сацыял-дэмакратычная партыя Даніі, засн. ў 1871, уваходзіць у Сацыяліст. Інтэрнацыянал, аб'ядноўвае вял. колькасць рабочых і служачых, прадстаўнікоў дробнай буржуазіі і бурж. інтэлігенцыі; Камуністычная партыя Д., засн. ў 1919. 8 тыс. чл. (на люты 1969). Старшыня К. Есперсен. Цэнтральнае аб'яднанне прафсаюзаў Д., засн. ў 1898. Яднае 67 галіновых прафсаюзаў, 818 тыс. чал.


Гаспадарка. Д.— індустрыяльна-аграрная краіна развітага капіталізму. У эканоміцы пануюць манапал. аб'яднанні, значныя пазіцыі займае іншаземны капітал. Дзярж. сектару належаць пераважна транспарт, сувязь, энергетыка. Сельская гасп. спецыялізуецца на пастаўках мяса-малочнай прадукцыі на знешні рынак. Прамысловасць базіруецца на перапрацоўцы імпартнай сыравіны і паўфабрыкатаў, энергетыка — на імпартным паліве. Невялікая здабыча лігнітаў (каля 1,5 млн. *т* за год), кааліну, солі, мелу. Выпрацоўка электраэнергіі (12 млрд. *квт·гадз* у 1968) пераважна на ЦЭС (самая вялікая «Аснесверкет» каля Калунбарга, 500 тыс. *квт*). У 1968 выплаўлена (тыс. *т*) чыгуну 186, сталі 457, алюмінію 7,5. Па колькасці занятых (38% ад усіх занятых у прамысловасці краіны) і кошту валавога прамысл. прадукту (31,7%) 1-е месца належыць металаапрацоўцы і машынабудаванню, асабліва суднабудаванню. Д. на 7-м месцы сярод капіталіст. краін па суднабудаванні (462 тыс. бр. рэг. *т* — танаж суднаў, пабудаваных у 1969). Гал. верфі ў Капенгагене, Одэнсе, Хельсінгёры, Накскаве. Прамысловасць па абслугоўванні суднабуд. і партовай гаспадаркі (суднавыя рухавікі, прылады, падымальныя краны і інш.). Электратэхнічная, радыёэлектронная прамысловасць, вытворчасць абсталявання для харч. і буд. (асабліва цэментнай) прамысловасці. 2-е месца займае харчасмакавая прамысловасць. Прадпрыемствы для перапрацоўкі малака і мяса, цукровыя, тытунёвыя, піваварныя, рыбаперапрацоўчыя, маргарынавыя. Асн. цэнтры харч.




Рыбалоўны порт Лёкен.

прамысловасці: Капенгаген, Одэнсе, Скаген, Эсб'ерг, Хорсенс, в-аў Борнхальм. Хім. і нафтаперапрацоўчая прамысловасць выпускае азотныя і фосфарныя ўгнаенні, лакі, фарбы, сінт. матэрыялы, фармацэўтычныя і гумавыя вырабы. Магутнасць нафтаперапр. з-даў 7 млн. *т* сырой нафты (з-ды ў Калунбарэе і Фрэдэрысіі). Лёгкая прамысловасць: тэкст., швейная, трыкатажная, абутковая. Асн. цэнтры: Капенгаген, Вайле, Хернінг, Вібарг. Цэментная (2,3 млн. *т* у 1968), керамічная, шкляная прамысловасць. У Капенгагене вялікі фарфоравы з-д, вядомы маст. вырабамі. Лесапераапрацоўка, мэблевая, папяровая, паліграфічная прамысловасць. С. гасп. высокамеханізаваная і прадукцыйная. $^{9}/_{10}$ с.-г. прадукцыі дае жывёлагадоўля (малочнага і беконнага кірунку). У 1969 (млн. галоў) буйн. раг. жывёлы 3,0 (у т. л. малочных кароў 1,2), свіней 8,0, курэй 18,9. Асн. с.-г. культуры: ячмень (1170 тыс. *га*, збор 5,2 млн. *т*, 1969), авёс (243 тыс. *га*, 905 тыс. *т*) і збожжавая мяшанка (97 тыс. *га*, 328 тыс. *т*). Сеюць пшаніцу (91 тыс. *га*, 421 тыс. *т*), цукр. буракі (52 тыс. *га*, 2139 тыс. *т*), бульбу (38 тыс. *га*, 857 тыс. *т*), лён і інш. Штогод ловяць больш за 1 млн. *т* рыбы. Даўж. чыгунак 3,5 тыс. *км*, чыг. марскіх перапраў з паромамі 700 *км* (су-

Электрастанцыя «Сванемелевэрке» ў Капенгагене.



вязь са Швецыяй, ГДР, астравамі). Аўтамаб. дарог 5,6 тыс. *км*. Танаж гандл. флоту 3,4 млн. бр. рэг. *т* у 1969 — 13-е месца сярод капіталіст. краін. Гал. порт Капенгаген. Авіятранспарт. Асн. гандл. сувязі з краінамі Зах. Еўропы (Вялікабрытаніяй, ФРГ, Швецыяй). На сацыялістычныя краіны прыпадае 4% знешнегандл. абароту Д. У 1969 экспарт склаў 22,1 млрд. крон, імпарт 28,5 млрд. крон. Д. экспартуе прадукцыю с. гасп. (масла, сыр, мяса і вырабы з мяса), металаапр. і маш.-буд. прадукцыю (пераважна суднаў, с.-г. машыны), медыкаменты і інш. Прывозіць металы, паліва, прамысл. паўфабрыкаты, лес, хім. тавары, тэкст. сыравіну. Грашовая адзінка — крона.



Суднаверф у Хельсінгёры.

Узброеныя сілы Д. складаюцца з сухап. войск, ВПС і ВМС. У 1968 мелі каля 50 тыс. чал. Узначальваюцца вярх. галоўнакамандуючым (каралём) і міністрам нац. абароны. У адпаведнасці з праграмай НАТО на тэр. Д. пабудаваны ваен. аэрадромы, сховішчы для паліва, арганізаваны пасты папярэджання, сістэмы апавяшчэння і сувязі. Узбр. сілы Д. актыўна ўдзельнічаюць у ваенных мерапрыемствах НАТО. ЗША маюць ваенныя базы ў раёнах Туле, Сёнрэ-Стромфіёрд і Нарсарсуак (Грэнландыя).

Ахова здароўя. Сістэма аховы здароўя страхавая. У 1964 было 173 бальніцы на 48 832 ложкі (91 на 10 тыс. нас.), з іх 136 бальніц (на 37 974 ложкі) дзяржаўных. Паліклінічная дапамога пераважна прыватная. Бюджэтныя расходы (1965) 2560 млн. крон (541 крона на душу нас.). У 1967 працавала 6560 урачоў (1 на 730 ж.), 3040 зубных урачоў, 20 тыс. мед. сясцёр, 620 акушэрак, 351 фармацэўт. Рыхтуюць урачоў на мед. ф-тах ун-таў у Капенгагене і Орхусе. У 1968 нараджальнасць 15,3, агульная смяротнасць 9,6, натуральны прырост 5,7 на 1000 ж., дзіцячая смяротнасць 15,8 на 1 тыс. жыванароджаных (1967). Сярэдняя працягласць жыцця мужчын 70,3, жанчын 74,6 года. Найб. пашыраны грып, адзёр, коклюш, шкарлятына, эпідэмічны гепатыт, ганарэя, сіфіліс.

Асвета, навуковыя ўстановы. Сучасная сістэма адукацыі Д.: дзіцячыя сады для дзяцей 3—7 гадоў; абавязковая пач. адукацыя дзяцей 7—14 гадоў (ажыццяўляецца пераход да 9-гадовага абавязковага навучання ў нар. школе); сярэдняя школа двух тыпаў, кожны з іх мае дзве ступені — рэальная школа і падрыхтоўчая школа (3+2), рэальная школа і гімназія (2+3). У 1967/68 навуч. г. ў пач. школах вучылася 523 тыс., у сярэдняй 179,5 тыс. чал., у сістэме прафесійна-тэхн. падрыхтоўкі 139,4 тыс. навучэнцаў. Самыя вялікія ВНУ: ун-ты ў Капенгагене, Орхусе (засн. ў 1928) і ў Одэнсе. Тэхн. ун-т Д., Інж. акадэмія ў Капенгагене. Б-кі: Муніцыпальная, Публічная і б-ка ун-та ў Капенгагене, Дзярж. і б-ка ун-та ў Орхусе. Музеі: Нац., Каралеўскі музей прыгожых мастацтваў, музей г. Капенгагена (усе ў Капенгагене), музей мастацтваў у Орхусе.

Дацкая каралеўская акадэмія навук і літаратур, Каралеўская акадэмія прыгожых мастацтваў і Акадэмія тэхн. навук, 17 н.-д. устаноў і інш.

Друк, радыё, тэлебачанне. У 1968 у Д. выдавалася 129 газ. і 30 штотыдзённых часопісаў агульнага характару і каля 500 спецыялізаваных штотыдзённых і штомесячных часопісаў. Найб. масавыя выданні: «Berlingske Tidende» («Ведамасці Берлінга»), орган Кансерватыўнай народнай партыі; «Politiken» («Палітыка»), орган Радыкальнай левай партыі; «Aktuelt» («Актуальна»), орган С.-д. партыі Д.; «Fyns Tidende» («Фюнскія ведамасці»), орган Левай ліберальнай партыі; «Land og Folk» («Краіна і народ»), «Tiden» («Час»), органы КПД. Ritzaus Bureau, дацкае інфарм. агенцтва. Dansk Radio, дзярж. служба, якая кантралюе ўсе радыё- і тэлепередачы краіны.

Літаратура. Развіваецца на дацкай мове. Найб. стараж. творы фальклору звязаны з стараж.-ісландскай эпічнай паэзіяй. Сярэдневяковая л-ра Д. мела пераважна рэліг. характар. У 12 ст. створаны гістар. працы на лац. мове; найб. значная — «Гісторыя Даніі» (выд. 1514) Саксона Граматыка. Першая гістар. праца на дац. мове — «Рыфмаваная хроніка» (1495). Станаўленне нац. л-ры адбываецца ў эпоху Рэфармацыі. Л-ра 18 ст. развіваецца пад знакам Асветніцтва. Найб. значная фігура — паэт і гісторык Л. Хольберг, стваральнік дацкага тэатра, рэфарматар мовы; яго камедыі насычаны рэаліст. элементамі. У 2-й пал. 18 ст. асн. кірунак — сентыменталізм (І. Эвальд, Е. Багесен). У пач. 19 ст. ўзнік рамантызм, які меў спецыфічную патрыят.-дэмакр. афарбоўку, асабліва ў нац.-гістар. драмах А. Г. Эленшлегера. З рамантызмам звязана і творчасць Х. К. *Андэрсена*; дэмакратызм і гуманізм, рэаліст. рысы і маст. дасканаласць яго казак прынеслі Андэрсену сусв. вядомасць. У сярэдзіне 19 ст. ў рамантызме ўзмацніліся рэліг.-містычныя тэндэнцыі, звязаныя з філасофіяй С. К'еркегора і адлюстраваныя ў творчасці Ф. Палудан-Мюлера. Значную ролю ў фарміраванні рэаліст. кірунку ў 70-я г. адыграў крытык і гісторык л-ры Г. *Брандэс*, знаўца рус. л-ры, асабліва творчасці І. Тургенева; пазней Брандэс перайшоў на пазіцыі натуралізму. Самыя выдатныя прадстаўнікі крытычнага рэалізму ў л-ры Д.— Е. П. Якабсен і Х. Пантопідан. У канцы 19 ст. ў творчасці Г. Банга, К. Г'елерупа і І. В. Іенсена паявіліся антырэаліст. тэндэнцыі. Новы этап у развіцці л-ры Д.— творчасць М. *Андэрсена-Нексё*, першага пралет. пісьменніка, пачынальніка сацыяліст. рэалізму ў дацкай л-ры. У 30-я г. пісьменнікі Д. зрабілі істотны ўклад у барацьбу з фашызмам; у час гітлераўскай акупацыі многія ўдзельнічалі ў Руху Супраціўлення. У 1944 нелегальна выйшаў калектыўны антыфаш. зб. «Гарыць агонь». Традыцыі Андэрсена-Нексё прадоўжаны ў творах Х. Кірка, К. Бекера, Х. Хердаля, Х. Шэрфіга, Х. Вульфа, паэта О. Гельстэда і інш.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. Помнікі маст. культуры на тэр. Д. вядомыя з 8-га тысячагоддзя да н. э. Ад часоў вікінгаў асталіся рэшткі умацаванняў крэпасці Трэлебарг на в-ве Зеландыя. У 10—12 ст. будуецца шмат цэркваў (базілікальная Маці боскай у Роскіле, крыжова-купальныя саборы ў Рыбе і Вібарзе). У росписах раманскіх цэркваў адчуваецца ўплыў візант. жывапісу. Найлепшыя помнікі гатычнага перыяду (пач. 13 — пач. 16 ст.) — саборы ў Роскіле і Одэнсе. Роспісы гатычных сабораў менш умоўныя, чым раманскіх. З 2-й пал. 15 ст. ў Д. працуе шмат прыезджых майстроў. Архітэктуры 16—18 ст. характэрна буд-ва палацаў, грамадскіх і жылых дамоў, у дэкоры якіх выявіліся рысы Рэнесансу (біржа і палац Росенбарг у Капенгагене), барока і ракако. Выдатны помнік дацкай архітэктуры 18 ст.— ансамбль Амаліенбарг (арх. Н. Эйтвед, Н. Жардэн). Заснаванне АМ у Капенгагене (1754) садзейнічала развіццю ў Д. класіцызму (2-я пал. 18 — 1-я пал. 19 ст.). У той час склалася і нац. маст. школа. Вядомыя прадстаўнікі класіцызму: арх. К. Ф. Харсдорф, К. Ф. Хансен, М. Г. Бінесбёль, скульптар Б. *Торвальдсен*, гістар. жывапісец Н. А. Абільгар. Вызначальнае месца ў жывапісе 1-й пал. 19 ст. належала К. В. Эккерсбергу і яго паслядоўнікам (К. Кёбке і інш.). Новаму ўздыму жывапісу ў канцы 19 — пач. 20 ст. садзейнічала творчасць групы мастакоў, якія распрацоўвалі праблемы пленэру (П. С. Кроер, В. Іохансен). З імі быў звязаны скульптар і жывапісец Т. Э. Філіпсен, пачынальнік дацкага імпрэсіянізму. Перайманне стыляў інш. эпох і эклектызм характэрныя дацкай архітэктуры 2-й пал. 19 ст. У канцы 19 ст. ўзнік нац. рамантызм (арх. М. Нюрап, П. В. Енсен-Клінт і К. Клінт). З 30-х г. пашыраецца функцыяналізм (ун-т у Орхусе, 1932—46, К. О. Фіскер і інш.). Пасля 2-й сусв. вайны ідзе рэканструкцыя і забудова г. Одэнсе, Капенгагена, аднаўленне г. Роне і Нексё. З пач. 20 ст. ў Д. суіснуюць самыя розныя маст. плыні. Мадэрнісцкім кірункам процістаяць жывапіс О. Рудэ, Х. Енсена, графіка І. Крыстэнсена. Сярод скульптараў 20 ст. К. Нільсен, І. К. Б'ерг і інш. Асобнае месца займае рэалістычная, сацыяльна завостраная графіка Х. *Бідструпа*. Іл. гл. на ўкл.



П. С. Кроер. Рыбакі ў краме. 1882. Збор Хіршспрунга. Капенгаген.

Музыка. Носьбітамі муз. культуры сярэдневякоўе былі вандроўныя музыканты — легеры, прыдворныя спевакі-паэты скальды. З 12 ст. развіваецца культавая музыка, у 15—16 — свецкая (каралеўскія капэлы). Нац. самабытнасць музыка Д. набывае ў канцы 18 ст. Першая дацкая опера — «Хольгер Данске» Э. Кунцэна (1789). Нац. характэрнасць выявілася ў зінгшпілях І. Шульца, Ф. Кулаў, К. Э. Вейсе. Кампазітары-рамантыкі — І. Хартман, П. Хейсе, Н. Гадэ (кіраўнік скандынаўскай кампазітарскай школы). Заснавальнікам сучаснай нац. школы стаў К. Нільсен. На мяжы 19—20 ст. у Капенгагенскім каралеўскім оперным т-ры (засн. ў 1713) ішлі оперы А. Эйны, П. Ланге-Мюлера, А. Хамерыка. З сучасных кампазітараў: К. Рысагер, Н. В. Бентсан, В. Хольмба. У Капенгагене створаны Дацкае канцэртнае т-ва (1911), саюзы музыкантаў (1911) і кампазітараў (1913), Філарманічнае т-ва (1920), хор і аркестр Дацкага радыё (1925) і інш.

Тэатр. Элементы тэатр. мастацтва былі ў творчасці скальдаў. У сярэднія вякі пашыраны паказы «нараў» (літар. дурняў), містэрый, літургічных драм, маралітэ. У 1722 у Капенгагене адкрыўся т-р «Дацкая сцэна» (з 1770 наз. Каралеўскі т-р). Драматургія 2-й пал. 18 ст. (асабліва Л. Хольберга) і творчасць выдатных акцёраў (А. Г'ельструп і інш.) залажылі асновы нац. камед. акцёрскай школы. У 1-й пал. 19 ст. творы А. Эленшлегера вызначылі развіццё школы акцёрaў-рамантыкаў (І. Руге, Н. Нільсен і інш.). П'есы І. Л. Хейберга, К. Хострупа, Х. Херца садзейнічалі росквіту сцэн. рэалізму (І. Хейберг, А. Нільсен, В. Іпсен, Б. Нансен). У пач. 20 ст. т-р перажывае крызіс. У 20-я г. ўзнікаюць рабочыя т-ры і агітбрыгады. Створаны антыфаш. спектаклі па п'есах К. Абеля, К. Коі, К. Мунка (30-я г.). У час акупацыі ставіліся гістар. п'есы, дацкая класіка; пасля вызвалення Д.— п'есы пра Рух Супраціўлення. Уступленне Д. ў НАТО (1949), праследаванне прагрэс. грамадскіх дзеячаў, ідэйны крызіс ліберальнай інтэлігенцыі тармозяць развіццё т-ра і драматургіі. Традыцыі рэаліст. мастацтва не пакідае Каралеўскі т-р. Сярод дзеячаў — С. Бесекаў, В. Квістгар, П. К'ерульф-Шміт, Э. Тымрат, О. і Ф. Хельмуты, С. Хорне-Расмусен.

Кіно. У 1897 пачалася нац. кінавытворчасць. У 1906 у Капенгагене створана кінафірма «Нордіск» (акцёры А. Нільсен, О. Фёнс, В. Псіландэр). Сац. праблемы характэрныя фільмам рэжысёраў К. Т. Дрэера, І. Якабсена, А. і В. Хенінг-Енсенаў, Э. Тымрата, Э. Балінга, П. К'ерульф-Шміта. У 60-я г. выпускаюцца пераважна банальныя муз.

намедыі, меладрамы, вылучаюцца дакумент. і кінахроніка-метражныя фільмы (рэж. Т. Крыстэнсен, І. Рое і інш.).

Літ.: Ланін У. І. Целы дзесяцігадовага «сацыялістычнага» міністэрства, Тв., т. 23 (Поли. собр. соч., т. 30); яго ж, Аграрнае пытанне і «крытыкі Маркса», Тв., т. 13 (Поли. собр. соч., т. 5); Серебряный Л. Р. Физическая география и четвертичная геология Дании, М., 1967; О'Делл Б. Скандинавия, пер. с англ., М., 1962; Форстен Г. В. Борьба за господство на Балтийском море в XV и XVI ст., СПб., 1884; яго ж, Балтийский вопрос в XVI и XVII ст. (1544—1648 гг.), т. 1—2, СПб., 1893—94; Нольде Б. Э., Скандинавские страны и СССР, М., 1958; Кан А. С. Внешняя политика скандинавских стран в годы второй мировой войны, М., 1967; Пронофьев В. Северная Европа и мир, М., 1966; Лунд Р. Влияние Октябрьской революции на рабочее движение в Дании, пер. с датского, М., 1957; Неустроев Н. П. Датская литература, у кн.: История зарубежной литературы конца XIX — начала XX в. (1871—1917), [М.], 1965; яго ж, Датская литература, Мартин Андерсен-Нексе, у кн.: История зарубежной литературы после Октябрьской революции, ч. 1, [М.], 1969; Кристенсен С. М. Датская литература 1918—1952 гг., пер. с дат., М., 1963; Всеобщая история искусств, т. 2, кн. 1, М., 1960, с. 471—476; т. 4, М., 1965, с. 455—458; т. 6, М., 1964, с. 504—509; т. 6, кн. 1, М., 1965, с. 285—289; Всеобщая история архитектуры, т. 4, М.—Л., 1966, с. 570—586; т. 5, М., 1967, с. 612—625; т. 7, М., 1969, с. 462—467; Poulsen V. Peinture et sculpture au Danemark, Kobenhavn, 1960; История западноевропейского театра, т. 2, М., 1957; Neergaard E. Historien om dansk film, Kobenhavn, 1960; Садуль Ж. Всеобщая история кино, пер. с франц., т. 2, 3, 6, М., 1958—65.

Л. І. Крыстэнсен (насельніцтва, гаспадарка), А. С. Кан (гісторыя, палітыка да 1945), Н. Васільеў (гісторыя, палітыка з 1945), В. В. Клепікаў (асвета), Масква; І. Н. Купрыянава (літаратура), Ленінград.

ДАНІІКІ, феадальна залежныя сяляне ў Вялікім княстве Літоўскім у 15—16 ст. Гл. *Сяляне-данікі.*

ДАНСКАЯ народа коней, вярхова-запражная парода, выведзеная ў 19 ст. данскімі казакамі скрыжаваннем мясцовых паўдзіка-стэпавых коней з туркменскай, карабахскай і персідскайародамі. Выкарыстоўваецца для паляпшэння мясцовых парод (Магілёўская і Віцебская вобл.).



У коней гэтай пароды тып і сіпіна рознага, прыкі тыпавой, моцныя, сухія. Канстытуцыя моцная. На умовах Беларусі сярэдніх памераў жарабцоў (у см): вынас у карпу 150—160, косая даўж. тулава 150—162, абхват грудзей 182—190, абхват пясці 20—21; набыў адпаведна: 150—159, 152—160, 170—187, 16,5—20,6. Жывая маса жарабцоў 520—600, набыў 520—640 кг. Масць валацюга-рудая. Развадзь пад сядлом з 4 ж на 5 мін 24 сек. Данскія коні выносныя, даўгавечныя, добра прыстасоўваюцца да умоў.

Літ.: Гл. пры арт. *Конезавод№ 1.*

ДАНСКІХ Аляксандр Іванавіч (н. 1918, в. Верхняя Ваброўка Варнаульскага нав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну, Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС. На фронце з 1943. Вызначыўся ў Вабруйскім р-не. 26.6. 1944 стралк. ўзвод на чале з Д. ваханў вамі-ніраваны мост цераз р. Ала, адбіў 2 контратакі праціўніка. Жыве ў г. Назарава Краснаярскага краю.

ДАНСКОЙ Марка Самёнавіч (н. 6.3.1901, Адэса), рускі савецкі рэжысёр кіно і сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1966). Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1945. З 1926 працуе ў кіно. Ленінскія фільмы: трылогія «Дзяцінства», «У людзях» і «Мае універсітэты» (1938—39), «Радуга» (1943), «Несакронены» [Залаты медаль 7-га Міжнар. кінафестывалю (Мюнхен) у Венецыі, 1946], «Сельская настаўніца» (1947), «Фама Гардзееў» (прэмія 13-га Мюнхен у Ланарна, 1960), дылогія «Сэрца маці» і «Вернасць маці» (1965—66). На кінастудыі «Сав. Беларусь» сцэнарыст і рэж. фільма «У вялікім горадзе» і асістэнт рэж. на мантажы фільма «Яго ненавідзьможнасць» (1928). Дэпутат, прэміі СССР 1941, 1946, 1948, 1968. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўн. Чырв. Сцяга.



ДАНТОН (Danton) Жорж Жак (26.10.1759—5.4.1794), дзеяч французскай бурж. рэвалюцыі канца 18 ст. Па адукацыі юрыст. Вызначыўся ў першыя дні рэвалюцыі прамоўніцкім талентам. Меў шырокую папулярнасць. Выказваў перадавыя погляды, аднак доўга не адважваўся выступіць супраць манархіі. Падтрымаў паўстанне 10.8.1792, якое скінула манархію, пасля гэтага ваяваў пасаду міністра юстыцыі ў новым урадзе. Быў асабліва актыўны і энергічны ў мабілізацыі нар. мас на абарону рэвалюц. Францыі ў час наступлення аўстра-прускіх інтэрвентаў на Парыж (жн.—вер. 1792). Заклік Д. «Каб перамагчы ворагаў айчыны, патрэбна смеласць, смеласць і зноў раз смеласць» высока цанілі К. Маркс, Ф. Энгельс і У. І. Ленін. У вер. 1792 выбраны дэпутатам Канвенту (вышэйшага заканадаўчага і выканаўчага органа першай франц. рэспублікі) і выйшаў з урада. Пасля паўстання 31.5—2.6.1793, якое ўсталявала ўладу якабінцаў (гл. *Якабінская дыктатура*), выступаў за прымірэнне з жырандыстамі, якія на гэты час сталі контррэвалюц. сілай. Неўзабаве ўзначаліў групу прадстаўнікоў контррэвалюц. буржуазіі, якая патрабавала паслаблення якабінскай дыктатуры. 2.4.1794 Д. і яго паплечнікі асуджаны Рэвалюц. трыбуналам і пакараны смерцю.


Літ.: Фрыдлянд Ц. Дантон, 3 выд., М., 1965.

ДАНТЭ Аліг'еры (Dante Alighieri; май 1265, Фларэнцыя — 14.9.1321), італьянскі паэт, пачынальнік літаратуры Адраджэння, пачынальнік італьян. літ. мовы. З дварян. Каб мець магчымасць удзельнічаць у паліт. жыцці рэспублікі, у 1295 увайшоў у адзін з «старэйшых» цэхаў Фларэнцыі. Пяленаў да гвельфаў (партыі гарадской буржуазіі). Пасля расколу гэтай партыі далучыўся да «белых» гвельфаў, якія арыентаваліся на імператарскую ўладу. У 1300 выбраны прыёрам Фларэнцыі. Калі перамаглі «чорныя» гвельфы (прыхільнікі папы), ваяваў ганенне. У 1302 прыгаворан за-











Данія.

1. Зах. ўзбярэжжа вострава Лангелан і злучаны з ім мостам востраў Тосінге.
2. Порт у Капенгагене.
3. Старажытная дацкая прамысловасць — вытворчасць вырабаў з серабра.
4. Вытрымліванне сыроў у спецыяльна абсталяваных пячорах.
5. Даследчы атамны цэнтр каля Капенгагена.
6. В. Торвальдсен. Ясон з залатым руном. 1802—03.
7. Х. Відструп. Самакрытыка. 1960.
8. К. Кёбке. Сястра мастака. 1831.













Драўлянае дойлідства. 1. Царква ў Боргуне. Нарвегія. Каля 1150. 2. Пакроўская царква (1764) і Праабражэнская царква (1714) на в-ве Кіжы. Карэльская АССР. 3. Вароты дома П. С. Хашавой у в. Юг, Горкаўская вобл. 2-я пал. 19 ст. 4. Зала для сходаў пры школе р-на Чыба каля Токіо. 1963. 5. Лямус у б. брыгіцкім манастыры ў Гродне. 17 ст. 6. Міхайлаўская царква ў Слуцку. 18 ст. 7. Званіца ў в. Нарач. Мядзельскі р-н Мінскай вобл. 18 ст.


вочна да спалення. Да канца жыцця быў паліт. эмігрантам. Памёр і пахаваны ў Равене. Ранняй любоўнай лірыцы Д., звязанай з паэт. школай «салодкага новага стылю», уласцівыя ўскладнёныя маральна-філас. ідэі, сімволіка і алегарызм, вытанчанасць маст. формы. Кн. «Новае жыццё» (каля 1292, санеты і канцоны, звязаныя паміж сабою празаічным каментарыем) з прапікнёным псіхалагізмам апавядае пра шчырае і ўзвышанае каханне паэта да Беатрычэ Партынары. У трактатах «Баль» (на італьян. мове), «Пра народнае красамоўства», «Пра манархію» (на лац. мове) услаўляе ў процілегласць латыні італьян. мову як мову л-ры і навукі, закладвае асновы параўнальнай раманскай філалогіі, ставіць надзённыя паліт. праблемы тагачаснай Італіі: заклікае да аб'яднання краіны і спынення грамадз. разладаў і міжусобіц, адстойвае незалежнасць свецкай улады ад папства. Вырашэнне гэтых праблем мела ў Д. утапічны і нават рэакц. характар: ён марыў пра стварэнне сусв. манархіі накшталт «Свяшчэннай Рымскай імперыі». Паліт., філас. і эстэт. погляды Д. найб. поўна выявіліся ў паэме «Камедыя» (3 ч.: «Пекла», «Чысцец», «Рай»; каля 1307—21), своеасаблівай філасофска-маст. энцыклапедыі сярэдневякоўя; адначасова ў ёй моцна адчуваюцца элементы новай гуманіст. культуры Адраджэння. Складаны хрысц. алегарызм, схаластыка, рэліг. дыдактызм мяжуюць у «Камедыі» з пластычнымі і яркімі замалёўкамі фларэнтыйскага жыцця, палымянай абаронай свабоды чалавечых пачуццяў, выкрыццём рымскай царквы і феад. забабонаў. За высокія маст. вартасці «Камедыя» ў 14 ст. названа «Боскай». Творчасць Д. зрабіла вял. ўплыў на развіццё еўрап. л-ры. Сусв. значэнне Д. глыбока раскрылі класікі марксізма. Ф. Энгельс пісаў: «Канец феадальнага сярэдневякоўя, пачатак сучаснай капіталістычнай эры адзначаны каласальнай фігурай. Гэта — італьянец Дантэ, апошні паэт сярэдневякоўя і разам з тым першы паэт новага часу» (Маркс К. і Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968, с. 63—64).



Тв.: Бел. пер.— у час. «Маладосць», 1965, № 5; рус. пер.— Божественная комедия, пер. М. Лозинского, М., 1968; Малые произведения, М., 1968.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967 (гл. ў т. 2 Паказальнік імён); Дживилегов А. К. Данте Алигиери. Жизнь и творчество, 2 изд., М., 1946; Баткин Л. М. Данте и его время. Поэт и политика, М., 1965; Елина Н. Г. Данте. Критико-биограф. очерк, М., 1965; Данте и славяне. Сб. ст., М., 1965; Голенищев-Кутузов И. Данте, М., 1967; Данте и всемирная литература. Сб. ст., М., 1967; Данте и его время. Сб. ст., М., 1968 (Библиогр., с. 196—210).

В. П. Міцкевіч. Мінск.

ДАНУКАЛАЎ Аляксей Фёдаравіч [16(29).2.1916, с. Новараслеўка Новаузенскага пав. Самарскай губ.— 27.4.1944], удзельнік партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў тэхнікум механізацыі с. гасп. (1936), ваен. вучылішча (1941). У Чырв. Арміі з 1937. У Айч. вайну ўдзельнік абароны Лепеля, Оршы, Смаленска; потым арганізаваў партыз. атрад, які дзейнічаў у Смаленскай і Віцебскай абл. У 1942 атрад рэарганізаваны ў брыгаду «Аляксея», камандзір Д. (гл. *Партызанская брыгада імя А. Ф. Данукалава*). Загінуў у час блакады брыгады нямецкімі войскамі. Пахаваны ў Лепелі Віцебскай вобл.



Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, т. 1, Мн., 1967; Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 367—376.

ДАНЦЫГ Май Вольфавіч (н. 27.4.1930, Мінск), беларускі савецкі жывапісец. Пасля заканчэння ў 1958 Маск. маст. ін-та імя Сурыкава выкладчык кафедры жывапісу Бел. тэатр.-маст. інстытута. Працуе ў галіне станковага жывапісу («Мінск. Новы мост», 1959; «Растуць новыя кварталы», 1959; «Горад абуджаецца рана», 1960; «Знатны шахцёр М. Герасіменя», 1960; «Новы Мінск», 1961; «На варце міру», 1964—65; «Мой Мінск», 1967; «Беларусь — маці партызанская», 1967; «Партызанскае вяселле», 1968; «Ленінская «Іскра», 1970) і манумент. мастацтва (мазаічнае пано ў кінатэатры «Партызан», Мінск, 1966; мазаіка ў гасцініцы «Юбілейная», Мінск, 1969). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1968 за карціны «Гудзе зямля Салігорская» («Вячэрняя змена», 1960), «Я знаю, горад будзе Салігорск» (1960), «Навасёлы» (1962), «У рабочай сталоўцы» (1963), «Сонечны дзень» (1966). Творам Д. ўласцівае жыццесцвярджальнае гучанне, яркая каларыстычная гама, дынамічная кампазіцыя, выразная пластыка фігур. Аўтар кніг «Пра што гавораць карціны» (1966), «Пра што гавораць скульптуры» (1968).

М. В. Данцыг. Партызанскае вяселле. 1968. Дзярж. маст. музей БССР.



джальнае ўспрыманне рэчаіснасці, жывапіснае майстэрства. У Дзярж. маст. музеі БССР 12 работ мастака. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Гістарычны жанр.*

Літ.: Вольфовский В. Верность теме, «Искусство», 1970, № 10.

ДАНЬКЕВІЧ Канстанцін Фёдаравіч [н. 11(24).12.1905, Адэса], украінскі савецкі кампазітар, дырыжор, педагог. Нар. арт. СССР (1954). Чл. КПСС з 1946. Скончыў Адэскі муз.-драм. ін-т (1929). Праф. Адэскай (з 1948) і Кіеўскай (з 1953) кансерваторый. У муз.-сцэн. творах увасобіў значныя сюжэты з нац. гісторыі (опера «Багдан Хмяльніцкі», 2-я рэд., паст. 1953), л-ры (опера «Назар Стадоля», 1959, і балет «Лілея», 1939, паводле Т. Шаўчэнкі), сав. рэчаіснасці (опера «Трагедыйная ноч», 1934). Аўтар араторыі «Кастрычнік» (1957), 2 сімфоній (1937, 1945), сімф. паэмы «Тарас Шаўчэнка» (1939) і інш. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Літ.: Михайлов Н. Н. Константин Федорович Данькевич, Киев, 1960.

ДАНЯЛЮК Аляксандр Пятровіч (парт. псеўд. Эдмунд Стафанскі, Олек, Зянон; 30.11.1897, Варшава — люты 1937), дзеяч КПП і рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З рабочых. Чл. РСДРП(б) з 1915, чл. КПП з 1919, чл. КПЗБ з 1923. За рэвалюц. дзейнасць у Ніжнім Ноўгарадзе і ў Разанскай губ. ў 1916 арыштаваны. Пасля Лют. рэвалюцыі вёў рэвалюц. работу ў Чугуеве і Нованікалаеўску, чл. Чугуеўскага рэўкома. Удзельнік баёў супраць контррэвалюц. Чэхаславацкага корпуса ў Самары. З 1919 у Польшчы; у 1921—23 сакратар акруговага к-та КПП Дамброўскага басейна, чл. ЦК кампартыі Усх. Галіцыі, у 1923—27 чл. ЦК КПП. Удзельнік арганіз. афармлення КПЗБ, прадстаўнік ЦК КПП на II канферэнцыі КПЗБ (30.11.1924), у 1924 кааптаваны ў ЦК, чл. сакратарыята ЦК КПЗБ. За рэвалюц. дзейнасць тройчы арыштаваны ўладамі бурж. Польшчы. У 1930 у апараце Выканкома Камінтэрна. У 1931—35 у кампартыі Румыніі — чл. ЦК і Палітбюро ЦК. З канца 1935 у СССР на гасп. рабоце. Аўтар публіцыст. артыкулаў.

Літ.: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966 (гл. Паказальнік імён).
М. С. Арэхва. Мінск.

ДАПАМОЖНАЯ АВІЯЦЫЯ, авіяцыя, прызначаная для забеспячэння кіравання войскамі, перавозкі раненых і хворых. У склад яе ўваходзіць авіяцыя сувязі, транспартная і санітарная авіяцыя.

ДАПАМОЖНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ, частка вытворча-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства, якая абслугоўвае *асноўную вытворчасць*, забяспечвае бесперапынны выпуск і рэалізацыю прадукцыі.

Склад, структура і маштабы Д. в. залежаць ад характару і аб'ёму асн. вытворчасці, галіновай ле прыналежнасці, тыпу вытворчай структуры і вытв. сувязей прадпрыемства. Асн. функцыі: выраб інструменту, штампаў, заменных дэталяў, мадэляў, тэхнал. аснасткі і забеспячэнне імі цэхаў і рабочых месцаў; рамонт мех., энерг., транспартнага абсталявання і догляд іх; работа энергасілавой гаспадаркі; кантроль якасці прадукцыі; хаванне, выдача і транспарціроўка ў цэхі сыравіны, матэрыялаў і паўфабрыкатаў. У некат. галінах прамысловасці да Д. в. адносіцца работа транспартнай і складской гаспадарак, тэхн. кантроль прадукцыі і г. д. Узровень арганізацыі і тэхн. аснашчанасці Д. в. уплывае на прадукцыйнасць працы, сабекошт прадукцыі. Таму навук.-тэхн. прагрэс патрабуе ўдасканалення Д. в. шляхам паглыблення яе спецыялізацыі, канцэнтрацыі, укаранення высокапрадукцыйнай тэхналогіі і перадавых метадаў буйнасерыйнай і масавай вытворчасці.

Літ.: Каменицер С., Конторович В. и Пищулин Г. Организация и планирование промышленных предприятий, 4 изд., М., 1967; Омаров А. М. Экономика и планирование промышленного предприятия, М., 1969. *Ф. А. Дронаў.* Мінск.

ДАПАМОЖНАЯ ШКОЛА, спец. навучальна-выхаваўчая ўстанова для разумова адсталых дзяцей. Тэрмін навучання 8 гадоў. Большасць Д. ш. мае інтэрнаты, у астатніх арганізаваны групы падоўжанага дня. Дзеці вучацца па спец. праграмах, набываюць асновы агульнаадук. ведаў. Больш за 1/3 навуч. часу займае прац. навучанне. Вядзецца карэкцыйная лячэбна-аздараўленчая і выхаваўчая работа. У БССР першыя Д. ш. адкрыты ў 1918—20 (у Мінску, Магілёве, Віцебску). Настаўнікаў для Д. ш. (алігафрэнапедагогаў) рыхтуе дэфекталагічнае аддзяленне ф-та пач. класаў Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага. Утрыманне дзяцей у Д. ш. БССР бясплатнае. Гл. таксама *Алігафрэнапедагогіка, Алігафрэнія.*

Літ.: Книга для учителя вспомогательной школы, под ред. Г. М. Дульнева, 2 изд., М., 1959; Принципы отбора детей во вспомогательные школы, под ред. Г. М. Дульнева и А. Р. Лурия, 2 изд., М., 1960. *Т. Л. Ляшчынская.* Мінск.

ДАПАМОЖНЫЯ РАБОЧЫЯ, рабочыя *дапаможнай вытворчасці.*

ДАПАНЫ, вёска ў Вярхоўскім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 15 *км* на Пд ад Бешанковіч, 66 *км* ад Віцебска, 18 *км* ад чыг. ст. Чашнікі. 127 ж., гасп. 42 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка.

ДАПАСАВАННЕ, від сінтаксічнай сувязі, пры якой залежнае слова ставіцца ў той форме (родзе, склоне, ліку ці асобе), што і галоўнае.

Д. бывае поўнае і няпоўнае. Пры поўным залежнае слова прымае ўсе формы галоўнага, а пры няпоўным — толькі некаторыя. У бел. мове, напр., поўнае Д. паміж прыметнікам і назоўнікам («новы дом», «новая хата», «новае акно»; «новага дома», «новай хаты», «новага акна»). Паміж выказнікам і дзейнікам можа быць поўнае («Я працую») і няпоўнае («Сын стаў доктарам»). Фармальны паказчык Д.— *канчатак.*

ДАПАЎНЕННЕ, даданы член сказа, які абазначае аб'ект і паясняе выказнік ці іншы член. У бел. мове выражаецца ўскосным склонам назоўніка і інш. часцінамі мовы.

Канкрэтызуе значэнне дзеяслова («люблю Радзіму»), назоўніка («палёт спадарожніка»), прыметніка («поўны сілы») і прыслоўя («добра з сябрам»). Прыдзеяслоўныя Д. падзяляюцца на прамыя і ўскосныя. Прамыя заўсёды залежаць ад перахаднага дзеяслова і выражаюцца вінавальным склонам без прыназоўніка («купляю мёд»), а таксама родным — пры адмоўі («не піў соку») і пры частковым ахопе прадмета дзеяннем («прыпёк хлеба»). Усе астатнія Д.— ускосныя.

Літ.: Граматыка беларускай мовы, т. 2 — Сінтаксіс, Мн., 1966. *А. Я. Баханькоў.* Мінск.

ДАПАЎНЯЛЬНАСЦІ ПРЫНЦЫП, метадалагічны прынцып, прапанаваны Н. Борам (1927) у сувязі з неабходнасцю стварэння лагічна несупярэчлівай фізічнай інтэрпрэтацыі *квантавай механікі.*

Мікраскапічныя аб'екты (электроны, фатоны і інш.) у розных эксперым. умовах могуць паводзіць сябе як строга лакалізаваныя часцінкі ці як хвалі. Аднак улічэнне пра суіснаванне карпускулярных і хвалевых уласцівасцей у адным і тым жа аб'екце звязана з неабходнасцю аб'яднання несумяшчальных паняццяў (напр., паняцце даўжыні хвалі ў пэўным пункце прасторы не мае сэнсу). У адпаведнасці з Д. п. пры тэарэт. апісанні мікраскапічных з'яў неабходна ўжываць дзве сістэмы макраскапічных паняццяў; прычым выкарыстанне адной з іх выключае магчымасць адначасовага выкарыстання другой. Аднак абедзве яны адналькава неабходныя для поўнага апісання квантавамеханічных сістэм і з'яўляюцца як бы ўзаемна дапаўняльнымі бакамі такога апісання. Д. п.— метадалагічнае абагульненне *неакрэсленасцей суадносін.* Н. Бор спрабаваў пашырыць Д. п. на апісанне біялагічных, сацыяльных і інш. з'яў, аднак такое абагульненне выклікала шэраг пярэчанняў.

Літ.: Кузнецов Б. Г. Принцип дополнительности, М., 1968. *Л. М. Тамільчык.* Мінск.

ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА, пачатковая ваенная падрыхтоўка моладзі да яе прызыву на абавязковую вайсковую службу. Ажыццяўляецца без адрыву ад вытворчасці і вучобы з мэтай набыцця практычных навыкаў маладога салдата, ведаў па адной з ваенна-тэхн. спецыяльнасцей, засваення асноў грамадзянскай абароны, а таксама ваенна-патрыятычнага выхавання.

ДАРАВА, вёска ў Федзюкоўскім с/с Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл., на р. Шчара. Цэнтр калгаса «Прагрэс». За 12 *км* на ПнЗ ад Ляхавіч, 231 *км* ад Брэста, 8 *км* ад чыг. ст. Баранавічы, на шашы Ляхавічы — Баранавічы. 107 ж., гасп. 37 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, радзільны дом, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 33 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА ГАРАДАМ 1785 (Грамата на правы і прывілеі гарадам Расійскай імперыі), заканадаўчы акт Кацярыны II ад 21.4.1785, які вызначаў структуру грамадства горада, арганізацыю і функцыі яго кіравання.

Жыхары горада падзяляліся на 6 разрадаў. Большасць гарадскога насельніцтва наз. мяшчанамі. Кожныя 3 гады «грамадства гарадское» выбіралі агульную гар. думу, са складу якой выбіраліся прадстаўнікі ад кожнага разраду ў «шасцігласную думу» — выканаўчы орган самакіравання горада, на чале з гарадскім галавою. Суд ажыццяўляўся выбраным гарадавым магістратам. Права голасу мелі заможныя жыхары з 25 гадоў. На тэр. Беларусі, уз'яднанай з Расіяй у 1772, 1773, 1795, Д. г. г. пашыралася на гарады, якія да гэтага карысталіся *магдэбургскім правам*, і мястэчкі, якія сталі цэнтрамі паветаў. Справы ў магістратах дазвалялася весці на аснове мясцовага грамадз. права, г. зн. Літоўскага статута 1588 і дадаткаў да яго, пастаноў сеймаў Рэчы Паспалітай з 1569, пасля 1831 на падставе агульнарасійскіх палажэнняў. Апеляцыйныя справы з тэр. Беларусі разглядала спец. камісія па іншародніцкіх справах. Новае гарадавое палажэнне ўведзена паводле *гарадской рэформы 1870.*

Публ.: Полное собрание законов Российской империи с 1649 г., т. 22, СПб., 1830.

Літ.: Жукович П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II, «Журнал Министерства народного просвещения», 1914, ч. 50, апрель. *В. М. Горцаў.* Мінск.

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА ДВАРАНСТВУ 1785 (Грамата на правы, вольнасці і перавагі шляхетнага расійскага дваранства), збор дваранскіх правоў і прывілеяў, заканадаўча аформленых актам Кацярыны II ад 21.4.1785.

Замацоўвала дваранскае званне, пацвярджала правы ўласнасці дваран на зямлю, нетры, воды, лясы, на прыгонных сялян, правы спадчыннасці маёнткаў і забарону іх канфіскацыі, дазваляла ў маёнтках гандаль, буд-ва ф-к і з-даў, вызваляла дваран ад службы, падаткаў, цялесных пакаранняў, пастою войск. Толькі дваранскі суд за цяжкія злачынствы мог пазбавіць дваранінa звання, уласнасці і жыцця. Органам самакіравання «дваранскага грамадства» быў дваранскі сход, які праз 3 гады выбіраў губернскіх і павятовых маршалкаў дваранства, суд засядацеляў і капітан-спраўнікаў. На Беларусі пасля ўз'яднання з Расіяй (1772—95) памешчыкі мелі тыя самыя прывілеі, выгоды і нават большыя правы, у т. л. бяспошлінныя даходы, права прапінацыі (вінакурэння і продажу гарэлкі), дазваляўся банкавым канторам выдаваць грошы пад залог маёнткаў.

Літ.: Гл. пры арт. *Дваранства.*
В. М. Горцаў. Мінск.

ДАРАВАЛЬНЫ НАДЗЕЛ, зямельны ўчастак памерам 1/4 вышэйшага надзелу, вызначанага сялянам пэўнай мясцовасці паводле Палажэнняў 19.2.1861.

Памешчык пры згодзе селяніна «дараваў» яму на ўласнасць надзел без выкупу (адсюль і назва) пры ўмове, што астатнія 3/4 надзелу пераходзілі ў распараджэнне памешчыка. Д. н. атрымалі каля 500 тыс. рэвізскіх душ сялян Расіі, прыблізна па 1 дзес. на душу. У Магілёўскай губ. і ў 8 паветах Віцебскай губ. Д. н. быў ад 1 да 1,4 дзес. Сяляне не маглі пракарміцца з Д. н. і мусілі зноў ісці працаваць на памешчыка. Народ называў Д. н. «чацвяртнымі», «сіроцкімі», «кашэчымі». Гл. таксама *Сялянская рэформа 1861.*

Літ.: Дарственное надельное землевладение крестьян (по обследованию 1907 г.), СПб., 1908; Зайончковский П. А. Отмена крепостного права в России, М., 1968. *В. А. Мілаванаў.* Мінск.

ДАРАВІТАСЦЬ, спалучэнне прыродных анатама-фізіялагічных і псіха-фізіялагічных асаблівасцей чалавека, якія выяўляюцца ў высокім развіцці яго *здольнасцей* і забяспечваюць яму магчымасць дасягаць асаблівых поспехаў у пэўных відах дзейнасці.

Адрозніваюць агульную і спец. Д. Агульная Д. характарызуецца такімі асаблівасцямі чалавека, яго первовай сістэмы, галаўнога мозгу (рухомасць нервовых працэсаў, хуткасць утварэння і трываласць нервовых сувязей, хуткасць выпрацоўкі дыферэнцыровак і інш.), якія даюць магчымасць добра развіць разумовыя ці інтэлект. якасці (кемлівасць, добрую памяць, увагу і г. д.). Спец. Д. заключаецца ў пэўнасці задаткаў, развіццё якіх забяспечвае паспяховае выкананне якой-н. спец. дзейнасці — музычнай, выяўленчай, тэхнічнай, спартыўнай і інш. Высокая Д.— ранняе выяўленне здольнасцей, хуткае фарміраванне навыкаў дзейнасці, пэўнасць самастойнасці і імклівае да творчасці. Без належнага выхавання, навучання і дзейнасці не можа выявіцца нават пры пэўнасці самых спрыяльных задаткаў. Гл. таксама *Геній.*

Літ.: Лейтес Н. С. Способности, труд, талант, М., 1961; Ярго Ж. Об умственной одаренности, М., 1960; Теплов Б. М. Проблемы индивидуальных различий, М., 1961. *В. М. Кавалёў.* Мінск.

ДАРАГАНАВА, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Асіповічы — Слуцк. За 20 *км* на ПдЗ ад Асіповіч, 166 *км* ад Магілёва. 628 ж., гасп. 259 (1971). Лясніцтва, пякарня, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 5 магазінаў. Помнікі на 2 брацкіх магілах 102 мірных жыхароў вёскі, якіх 5.8.1941 і ў пач. 1942 загубілі ням.-фаш. захопнікі, помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДАРАГАСТАЙСКІЯ, шляхецкі род, прадстаўнікі якога ў 16—17 ст. займалі кіруючыя

пасады ў Вял. кн. Літ. Прозвішча ад маёнтка ў Луцкім пав. У пач. 20 ст. Д. жылі ў Кіеўскай і Падольскай губ.

З Д. найбольш вядомыя: Мікалай, сын Мікалаеў (каля 1530—28.1.1597), стольнік літоўскі з 1563. Удзельнік падрыхтоўкі Люблінскай уніі 1569. Кальвініст. Удзельнік Лівонскай вайны. Ваявода полацкі з 1576, староста ваўкавыскі, шарашоўскі і лепельскі з 1577. Удзельнічаў у рэдагаванні тэксту Літоўскага статута 1566.

Крыштоф, сын Мікалаеў (2.3.1562—3.8.1615), стольнік літоўскі, староста мсцібаўскі, маршалак вялікі літоўскі з 1597, староста ваўкавыскі, шарашоўскі і лепельскі. Удзельнік Лівонскай і польска-шведскай войнаў. Кальвініст. Аўтар першай у Рэчы Паспалітай працы па анатоміі і фізіялогіі каня, якую выдаў у сваёй друкарні (маёнтак Мураванай Ашмянка). У 17—18 ст. праца перавыдадзена 7 разоў, была пашырана на Беларусі.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ДАРАПЕЕВІЧЫ, вёска ў Чарнянскім с/с Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «17 верасня». За 32 *км* на ПнУ ад Маларыты, 61 *км* ад Брэста. 699 ж., двароў 216 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДАРАСІНО, вёска ў Любанскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Рэвалюцыя». За 25 *км* на ПнЗ ад Любані, 145 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Урэчча. 841 ж., двароў 289 (1971). Сярэдняя школа, клуб, фельч.-ак. пункт.

ДАРАФЕЕНКА Раіса Ільінічна (н. 18.6.1933, в. Старынцы Віцебскага р-на), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Прац. дзейнасць пачала ў калгасе імя Калініна Віцебскага р-на, з 1950 даярка, з 1958 на свінаферме ў гэтым жа калгасе.

ДАРАФЕЕЎ Павел Іванавіч [н. 14 (27).1.1911, г. Ніжнеудзінск Іркуцкай губ.], савецкі вучоны, даследчык выкапнёвых насенных флораў (палеакарполаг). Д-р біял. н. (1965), ст. навук. супрацоўнік Бат. ін-та АН СССР. Удзельнік Айч. вайны. Даследуе насенныя флоры палеагену, неагену і антрапагену Рускай раўніны, Сібіры, Урала, Казахстана. З 1954 вывучае расліннасць Беларусі алігацэнавага, пліяцэнавага і плейстацэнавага ўзростаў. Выявіў кіравальныя комплексы выкапнёвых насенных флораў пліяцэну і антрапагену. Вынікі даследаванняў Д. па гісторыі расліннага покрыва спрыяюць больш дэталёваму стратыграфічнаму падзелу кайназойскіх адкладаў Беларусі і інш. раёнаў СССР. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: О третичной флоре Белоруссии, «Ботанический журнал», 1960, т. 45, № 10; Новые данные о плейстоценовых флорах Белоруссии и Смоленской области, у кн.: Материалы по истории флоры и растительности СССР, в. 4, М.—Л., 1963; О плиоценовой флоре Белоруссии, у кн.: Нижний плейстоцен ледниковых районов Русской равнины, М., 1967.

ДАРАШЭВІЧ Міхаіл Васілевіч [6(19).11.1900, г. Орша — 28.1.1968], беларускі савецкі вучоны-геадэзіст і дзеяч нар. адукацыі. Засл. дз. нав. і тэхн. БССР (1954), праф. (1961). Чл. КПСС з 1946. З служачых. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў Беларускую с.-г. акадэмію (1927). У 1928—29 працаваў у Наркамземе БССР. З 1930 на навук.-пед. і адм. рабоце ў ВНУ і НДІ БССР. Заг. кафедры геадэзіі (1933—41, 1945—59), дырэктар (1947—59) Бел. політэхн. ін-та. У 1959—68 міністр вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі БССР. Аўтар навук.-метадычных прац па розных відах геад. здымак, камеральнай апрацоўцы палявых матэрыялаў, выяўленні і вывучэнні тарфяных радовішчаў рэспублікі. На XXI, XXII і XXIV з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 4—5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Імем Д. наз. вуліца ў Мінску.

Літ.: Михаил Васильевич Дорошевич, «Геодезия и картография», 1968, № 6.

ДАРАШЭВІЧ Фёдар Іванавіч [н. 15(28).8.1905, мяст. Камянец-Літоўск Брэсцкага пав. Гродзенскай губ.], беларускі савецкі жывапісец. Чл. КПСС з 1967. Скончыў АМ у Ленінградзе ў 1938. Выкладчык маст. вучылішча (1938—41) і мастак Агітмайстэрні (1941—45) у Пярмі. З 1951 у Мінску. У 1960—66 выкладчык Бел. тэатр.-маст. ін-та. Працуе ў станковым жывапісе. Творам Д. ўласцівыя грамадзянскасць, выразнасць вобразаў, яснасць кампазіцыйных рашэнняў («Пошта прыйшла», 1960; «Страляйце, не шкадуйце нас!», 1964; «У. І. Ленін сярод першых чырвоных камандзіраў», 1970), уменне перадаваць сціплае хараство бел. прыроды («Пойма ракі Бярэзіны», 1953; «Ледаход на Бярэзіне», 1956; «У Белавежскай пушчы. Зубры», 1960). Сярод пейзажаў «На радзіме У. І. Леніна», 1969. У Дзярж. маст. музеі БССР 16 работ мастака.



Ф. І. Дарашэвіч. «Страляйце, не шкадуйце нас!». 1964. Дзярж. маст. музей БССР.

ДАРАШЭВІЧЫ, прыстань на левым беразе Прыпяці, вёска ў Ляскавіцкім с/с Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. За 22 *км* на З ад Петрыкава, 212 *км* ад Гомеля, 34 *км* ад чыг. ст. Муляраўка, на аўтамаб. дарозе Петрыкаў — Жыткавічы. 534 ж., двароў 205 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка. Помнік на брацкай магіле матросаў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Магіла Героя Сав. Саюза М. П. *Чалава.* Каля Д. група паселішчаў эпохі мезаліту і неаліту. Пры раскопках знойдзены крамянёвыя наканечнікі

стрэлаў, нажы, скрабкі, абломкі посуду з накольчатым арнаментам і інш. Помнікі адносяцца да мікралітычнай і *грабеньчата-накольчатай керамікі культуры.*

Літ.: Исаенко В. Ф. Мезолит Восточного Полесья, у кн.: Вопросы истории и археологии, Мн., 1966.

ДАРАШЭЎСКІ (Doroszewski) Вітольд Ян (н. 1.5.1899, Масква), польскі моваznавец. Правада. чл. Польскай (1957) і Балгарскай (1963) АН. Д-р філал. н. (1928), праф. Варшаўскага ун-та (з 1929). Даследчык словаўтварэння, фанетыкі, дыялекталогіі, семантыкі, лексікаграфіі, культуры мовы. Аўтар прац: «Манаграфія па словаўтварэнні» (ч. 1—4, 1928—31), «Пытанні агульнай фанетыкі» (1934), «Крытэрыі парматыўнасці ў мове» (1950), «Пра культуру слова» (т. 1—2, 1962—68). Рэдактар час. «Poradnik językowy» («Моўны дарадчык», з 1932), 11-томнага «Слоўніка польскай мовы» (з 1958). У 1931—34 вывучаў бел. народныя гаворкі на Палессі. Пытанні бел. мовы разглядае ў арт. «Роднасць моў у святле фактаў дыялекталогіі».


Тв.: Z zagadnień leksykografii polskiej, Warszawa, 1954; Podstawy gramatyki polskiej, cz. 1, 2 wyd., Warszawa, 1963; Elementy leksykologii i semiotyki, Warszawa, 1970.

Літ.: Skorupka S. Witold Doroszewski, «Nauka Polska», 1962, № 4. *М. Р. Судзік.* Мінск.

ДАРВАШ (Darvas) Іожэф (н. 8.2.1912, в. Орашхаза), венгерскі пісьменнік. Чл. ВСРП з 1956. Сын парабка. Міністр буд-ва (з 1945) і культуры (1950—54). З 1959 старшыня Саюза пісьменнікаў ВНР. У раманах «Чорны хлеб» (1934), «Ад Вадохрышча да св. Сільвестра» (1935), хроніцы «Гісторыя адной сялянскай сям'і» (1939) рэалістычна адлюстраваў сац. барацьбу сялянства. Аўтар раманаў «Пераможца туркаў» (1938), «У верасні ён адправіўся ў дарогу» (1940), п'есы «Бездань» (1941), публіцыст. кн. «Горад на дрыгве» (1945). П'еса «Неба ў куродыме» (1959) і раман «П'яны дождж» (1963) пра контррэвалюц. мяцеж 1956, сцвярджаюць непераможнасць сацыялізма ў ВНР.

Тв.: Рус. пер.— В сентябре он вышел в путь, М., 1960; Пьесы, М., 1962; Пьяный дождь, М., 1967.

ДАРВІН (Darwin) Чарлз Роберт (12.2.1809, г. Шрусберы — 19.4.1882), англійскі натураліст, заснавальнік эвалюцыйнага вучэння пра паходжанне відаў праз натуральны адбор. Скончыў Кембрыджскі ун-т (1831). У час кругасветнага падарожжа на караблі «Бігл» (1831—36) даследаваў флору і фаўну, зрабіў запісы па геалогіі, антрапалогіі, палеанталогіі, этнаграфіі. Вярнуўшыся ў Англію, апублікаваў «Дзённік натураліста» (1839) пра вынік падарожжа, дзе апісаў і цяжкае становішча індзейцаў Паўд. Амерыкі. У 1839—43 выдадзена 5 тамоў заалаг. матэрыялаў падарожжа (распрацаваных з удзелам найб.



вядомых англ. заолагаў); у 1842—46 тры тамы геал. даследаванняў (1-ы том «Каралавыя рыфы»), у 1851—54 кніга «Вусаногія ракі». Асн. праца — «Паходжанне відаў шляхам натуральнага адбору, ці захаванне спрыяльных пород у барацьбе за жыццё» (1859), у якой Д. паказаў, што віды раслін і жывёл не пастаянныя; мэтазгоднасць у прыродзе ствараліся і ствараецца праз натуральны і штучны адбор карысных для арганізма змен. Асобныя пытанні эвалюц. тэорыі распрацаваны ў творах «Змяненне свойскіх жывёл і культурных раслін» (1868), «Паходжанне чалавека і полавы адбор» (1871). Аўтар шэрагу прац па батаніцы, пра ўтварэнне перагною і інш. Гл. таксама *Дарвінізм, Эвалюцыйнае вучэнне, Адбор.*

Тв.: Рус. пер.— Иллюстрированное собрание сочинений, под ред. К. А. Тимирязева, т. 1—8, М., 1907—09; Соч., т. 1—9, М.—Л., 1935—59; Воспоминания о развитии моего ума и характера (Автобиография).— Дневник работы и жизни, М., 1957.

Літ.: Тимирязев К. А. Чарлз Дарвин и его учение, Избр. соч., т. 2, 1957; Некрасов А. Д. Чарлз Дарвин, М., 1957.

ДАРВІНІЗМ, вучэнне Ч. *Дарвіна* пра развіццё арганічнай прыроды, у аснове якога ляжыць закон натуральнага адбору (гл. *Адбор*). Ахоплівае комплекс біял. з'яў, у т. л. дае тлумачэнне *зменлівасці* і *спадчыннасці, барацьбы за існаванне* і інш.

Біялогія да Дарвіна ў асноўным абмяжоўвалася збіраннем фактычнага матэрыялу. Яна стаяла пераважна на ідэаліст. пазіцыях (сцвярджала, што жывыя істоты створаны богам). Толькі некат. вучоныя дадарвінаўскага перыяду адмаўлялі гэты погляд. Ж. Б. Ламарк вучыў, што віды жывёл і раслін узніклі адзін ад аднаго, але развіццё ён разумеў механістычна.

Дарвін адхіліў спробы сумясціць вучэнне пра развіццё ў прыродзе з прызнаннем надпрыродных сіл. Яго вучэнне зрабіла пераварот у поглядах на паходжанне відаў; паказала іх эвалюцыю ад ніжэйшых формаў да вышэйшых (адсюль назва Д.— *эвалюцыйнае вучэнне*). З узнікненнем Д. паявіліся або атрымалі новую тэарэт. і метадалагічную аснову вучэнне пра відаўтварэнне раслін і жывёл, марфалогія, сістэматыка, навука пра спадчыннасць і шляхі яе змены і многія інш. галіны біялогіі. Вучэнне Дарвіна пераадольвала механіцызм і інш. формы метафізікі, вяло да дыялектыка-матэрыялісц. тлумачэння развіцця жывой прыроды. Класікі марксізма-ленінізма бачылі ў Д. адно з прыродазнаўча-навук. абгрунтаванняў дыялект. матэрыялізму. Пашырэнне тэорыі натуральнага адбору і барацьбы за існаванне на з'явы грамадства — буржуазная фальсіфікацыя Д. (гл. *Сацыял-дарвінізм*).

Вядомыя дарвіністы 2-й пал. 19 ст. і пач. 20 ст.: у Расіі — І. І. Мечнікаў, А. А. Кавалеўскі, У. А. Кавалеўскі, К. А. Цімірязеў; у Англіі — Т. Гекслі, А. Уолес; у Германіі — Э. Гекель, Ф. Мюлер; у ЗША — А. Грэй і інш. У распрацоўку праблем Д. істотны ўклад зрабілі сав. вучоныя У. Л. Камароў, А. М. Северцаў, С. С. Чацверыкоў, М. І. Вавілаў, І. І. Шмальгаўзен, М. П. Дубінін, англ. даследчык Дж. С. Холдэйн і інш.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Ляго ж. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; Дарвин Ч. Происхождение видов путем естественного отбора, Соч., т. 3, М.—Л., 1939; Тимирязев К. А. Историче-

ский метод в биологии, Избр. соч., т. 2, М., 1957; Мечников И. И. О дарвинизме, М.—Л., 1943; Шмальгаузен И. И. Проблемы дарвинизма, 2 изд., Л., 1969; Яго ж. Факторы эволюции, 2 изд., М., 1968; Северцов А. Н. Главные направления эволюционного процесса, 3 изд., М., 1967; Дубинин Н. П. Эволюция популяций и радиация, М., 1966; Тимофеев-Ресовский Н. В. и др. Краткий очерк теории эволюции, М., 1969.

А. У. Канстанцінаў. Мінск.

ДАРВІШАЎ Віктар Андрэевіч (н. 2.11.1897, г. Прылукі Палтаўскай губ.), рускі савецкі рэжысёр. Працаваў у розных т-рах краіны, у т. л. ў 1933—34 у Ленінградскім акад. т-ры драмы. У 1934—37 маст. кіраўнік БДТ-2 (т-р імя Я. Коласа). Паставіў у БДТ-2 спектаклі: «Байцы» Б. Рамашова і «Чалавек вырашае» Дз. Курдзіна (1934), «Беспасажніца» А. Астроўскага і «Любоў Яравая» К. Транёва (1936), «Вайна вайне» і «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Банкір» А. Карнейчука (1937).

ДАРГАМЫЖСКІ Аляксандр Сяргеевіч [2(14).2.1813, в. Троіцкае Бялёўскага пав. Тульскай губ.— 5(17).1.1869], рускі кампазітар. Пачынальнік крытычнага рэалізму ў рус. музыцы. Вял. значэнне для фарміравання Д. як кампазітара мела блізкасць да М. Глінкі, чые традыцыі ён своеасабліва развіў. Схільнасць да канкрэтнай сац. тэматыкі, сатырычна-выкрывальныя тэндэнцыі ў творчасці Д. выявіліся пад уплывам эстэтыкі рэвалюц. дэмакратаў, сувязі з радыкальным сатыр. часопісам «Искра».



Д. ўвёў у рус. оперу тэму сац. няроўнасці (нар.-бытавая лірычная драма «Русалка» паводле А. Пушкіна, 1855, паст. 1856; няраз ставілася на сцэне Бел. т-ра оперы і балета), узбагаціў вобразамі бедных, зняважаных грамадскім ладам людзей жанр раманса («Тытулярны саветнік», «Чарвяк», «Стары капрал»). Імкнучыся да праўдзівага ўвасаблення слова ў гуках, насыціў вак. мелодыку інтанацыямі жывой гаворкі, што надало вял. сілу ўздзеяння яго оперным рэчытатывам, ператварыла некат. рамансы ў жанравыя сцэнкі («Млынар») ці лірычныя маналогі («І сумна; і нудна»). Стварыў тып рэчытатыўнай оперы («Каменны госць» па нязменены тэкст Пушкіна, закончана Ц. Кюі і М. Рымскім-Корсакавым, паст. 1872). У арк. творах («Маларасійскі казачок», 1864; «Чухонская фантазія», 1867, і інш.) прадаўжае лінію жанравага сімфанізму, якая ідзе ад «Камарынскай» і ісп. уверцюр Глінкі.

Літ. тв.: Избр. письма, в. 1, М., 1952.

Літ.: Пекелис М. Александр Сергеевич Даргомыжский и его окружение, т. 1, М., 1966; Ягo ж. Даргомыжский и народная песня, М.—Л., 1951; Серов А. Н. Избр. статьи, т. 1, М.—Л., 1950.

Н. М. Юдзеніч. Мінск.

ДАРДАНЕЛЫ, адзін з праліваў паміж Еўропай і Азіяй. Злучае Мармуровае і Эгейскае м., уваходзіць у сістэму Чарнаморскіх праліваў. Даўж. 120,5 *км*, шыр. 1,3—18,5 *км*, глыб. 53—106 *м*, салёнасць 29‰. Розная шчыльнасць вады Мармуровага і Эгейскага м. абумоўлівае наяўнасць у Д. двух процілегла накіраваных цячэнняў: паверхневага (з Пн на Пд) і прыдоннага (з Пд на Пн). Порты: Гелібалу (Еўропа), Чанакале (Азія).

ДАРЛІНГ (Darling), рака ў Аўстраліі, правы прыток Мурэя. У верх. цячэнні наз. Баруан. Пачынаецца на зах. схілах Вял. Водападзельнага хрыбта. Даўж. 2740 *км*, пл. бас. 520 тыс. *км*². Улетку Д. у ніжнім цячэнні перасыхае і ўтварае ланцуг стаячых вадаёмаў. У дажджавы перыяд узровень вады падымаецца да 10 *м* і Д. суднаходны да г. Берка. Выкарыстоўваецца для арашэння.

ДАРНАВА́ННЕ, 1) утварэнне адтулін («прашыванне») у нагрэтым злітку для атрымання загатоўкі трубы. 2) Д. ратацыйнае — спосаб размерна-чыставой апрацоўкі дэталяў машын пластычным дэфармаваннем паверхневага слоя. Робіцца ратацыйным дорнам.

Асн. элемент ратацыйнага дорна — шарыкі (або ролікі) з загартаванай сталі, якія пры абкочванні бесперапынна прыціскаюцца да паверхні, што апрацоўваецца. Ад гэтага згладжваюцца мікраняроўнасці і большае цвёрдасць паверхневага слоя. Ратацыйнае Д. ажыццяўляецца на такарных, расточных і інш. станках; дае чысціню апрацаванай паверхні 9—11 класаў, павялічвае цыклічную трываласць дэталяў, цвёрдасць іх паверхневага слоя амаль на 50%, зносаўстойлівасць у 1,5—3 разы. Прадукцыйнасць ратацыйнага Д. ў 7—10 разоў большая, чым шліфавання ці ханінгавання. Комплекс высокапрадукцыйных ратацыйных дорнаў, створаны пад кіраўніцтвам акад. АН БССР Я. Р. Канавалава ў Фіз.-тэхн. ін-це АН БССР, адзначаны Залатым медалём на веснавым Лейпцыгскім кірмашы 1967.

Літ.: Коновалов Е. Г. и Сидоренко В. А. Чистовая и упрочняющая ротационная обработка поверхностей, Мн., 1968.

І. Г. Дрывоцін. Мінск.

ДАРОЖКІН Мікалай Апанасавіч [н. 1(14).12.1905, с. Гарохаўка Бранскага пав. Арлоўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне фітапаталогіі і мікалогіі. Акад. АН БССР (1962, чл.-кар. 1950). Д-р с.-г. н. (1934), праф. (1933). Засл. дз. нав. БССР (1965). Чл. КПСС з 1927. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1927). Дырэктар Стара-Барысаўскага с.-г. тэхнікума (1929—30), Мінскай станцыі аховы раслін (1930—31). З 1931 у Ін-це біялогіі АН БССР: заг. лабараторыі фітапаталогіі, нам. дырэктара (1933—36), дырэктар (1936—40, 1948—52). Удзельнік партыз. руху ў Айч. вайну. Заг. кафедры сістэматыкі раслін БДУ імя Леніна (з 1947). З 1959 дырэктар Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы. Вывучаў біялогію ўзбуджальнікаў хвароб бульбы, выявіў новы цыкл развіцця фітафторы і рака бульбы, апісаў новыя формы паткоджання бульбы ракам. Распрацаваў агратэхн. метад барацьбы з гэтай хваробай, які шырока ўкараняецца на Беларусі, Украіне, у Прыбалтыцы, Чэхаславакіі, Румыніі. Распрацаваў новы



лабараторна-палявы метад ацэнкі ўстойлівасці сартоў бульбы да фітафторы і авіяхім. метад барацьбы з ёю. З 1959 вядзе работу ў галіне імунітэту бульбы і памідораў да фітафторы. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Першая спроба фітапаталагічна-энтамалагічнага абследавання бульбы ў СССР з мэтай дзяржаўнага карантыну, Мн., 1932; Галаўнёвыя захворванні вярнёвых культур і меры барацьбы з імі, Мн., 1934; Бульба, Мн., 1947; Болезни картофеля, Мн., 1955; (разам з А. А. Сапаговай) Болезни томатов, Мн., 1963.

ДАРОЖНЫ Сяргей (сапр. Серада Сяргей Міхайлавіч; 25.2.1909, Слонім — 19.7.1943), беларускі савецкі паэт. Сын службоўца. У 1915—21 з бацькамі ў бежанстве (Варонеж). Выхоўваўся ў Мазырскім дзіцячым доме (1921—24). Вучыўся ў Мінскім пед. тэхнікуме, у БДУ. Працаваў на гуце ў Барысаве, у рэдакцыях рэсп. газет і часопісаў. Друкавацца пачаў у 1925. Член літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша». Выдаў зб. вершаў «Звон вясны» (1926, з І. Плаўнікам), «Васільковы россып» (1929), «Пракосы на памяць» (1932). Славіў гераічныя будні маладой краіны сацыялізма (вершы «Новы дом», «Суботнік», «На ўдарных франтах», «Грыміць мураваны бетон...»), пісаў пра рэвалюц. барацьбу працоўных Зах. Беларусі («Вольны ліст зняволенаму брату» і інш.). Пераклаў на бел. мову паасобныя творы Дз. Беднага, М. Кальцова, У. Караленкі, С. Кірсанава, А. Новікава-Прыбоя, І. Уткіна, раман Г. Караваевай «Лесазавод» (1932).

Тв.: Выбраныя вершы, Мн., 1966.

Літ.: Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць, Мн., 1968, с. 151—155; Наднёманскія былі, Мн., 1968, с. 30—41.

І. У. Саламевіч. Мінск.

ДАРОЖНЫ БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ Галоўнага ўпраўлення шашэйных дарог пры СМ БССР, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і арганіз.-тэхн. пытанні будаўніцтва, рамонту і догляду аўтамаб. дарог і мастоў.

Засн. ў 1962 у Мінску. Аддзелы: дарожных канструкцый, тэхналогіі будаўніцтва, штучных збудаванняў, эканомікі, навук. арганізацыі працы, эксплуатацыі дарог. Дырэктар ін-та канд. тэхн. н. І. Я. Яўгеньеў (з 1965).

Асн. кірункі даследаванняў: выкарыстанне ў дарожным буд-ве мясцовых матэрыялаў і адходаў прамысловасці, буд-ва дарог у забалочанай мясцовасці, павышэнне транспартна-эксплуат. характарыстык дарог і мастоў, удасканаленне арг-цыі вытворчасці і павышэнне яе эканам. эфектыўнасці. Вынікі навук. даследаванняў: распрацавана тэхналогія ўмацавання цэментам дробнаазярністых пяскоў, прапанаваны метадалогія канструявання і разліку земляного палатна на тарфяных грунтах, метады павышэння грузападымальнасці мастоў без іх рэканструкцыі і інш. Выдадзены працы: «Будаўніцтва аўтамабільных дарог цераз балоты» І. Я. Яўгеньева (1968), «Эфектыўнасць выкарыстання вытворча-тэхнічнай і навуковай інфармацыі ў дарожнай гаспадарцы» Ю. Г. Кавалёва і Г. І. Шчарбіцкага (1968), «Дэфекты жалезабетонных аўтадарожных мастоў» В. В. Чаркасава (1969) і інш. З 1965 выдаюцца навук. зборнікі.

І. Я. Яўгеньеў. Мінск.

ДАРОЖНЫЯ ВОЙСКІ, спец. войскі для аднаўлення, рамонту, буд-ва і эксплуатацыі дарог, а таксама для дарожна-камендантскай службы. Складаюцца з асобных дарожна-будаўнічых, мостабудаўнічых і дарожна-камендантскіх часцей.

ДАРОЖНЫЯ МАШЫНЫ, агрэгаты і машыны для выканання комплексу работ па будаўніцтве, доглядзе і рамонце дарог. Шырока выкарыстоўваюцца ў гідратэхн., аэрадромным, прамысловым, гарадскім, с.-г. буд-ве і на інш. інж.-буд. работах.

Адрозніваюць Д. м. самаходныя, навясныя і прычапныя да трактароў і цягачоў. Паводле прызначэння падзяляюцца на групы для выканання пэўных відаў работ: падрыхтоўчых (індэкс машыны ДП), земляных (ДЗ), для ўшчыльнення грунту і пакрыццяў (ДУ), для зімовага і летняга догляду і рамонту дарог, іх эксплуатацыі (ДЭ), для буд-ва і рэканструкцыі дарожных і аэрадромных пакрыццяў (ДС). ДП ачышчаюць дарожныя палосы ці буд. пляцоўкі ад хмызняку, верхняга раслінага слоя, разрыхляюць грунт (дровавалы, карчавальнікі, кустарэзы, тралёвачныя і карчавальныя лябёдкі, рыхліцелі); ДЗ капаюць і перамяшчаюць грунт (*экскаватары, грэйдэры, канавакапальнікі, струг і, бульдозеры, скрэперы*); ДУ ўшчыльваюць пры буд-ве насыпаў, ушчыльненні асноў пад пакрыцці дарог (самаходныя і прычапныя *каткі*, вібратары, трамбавальнікі); ДЭ рамантуюць дарогі, падмятаюць і паліваюць пакрыцці, ачышчаюць іх ад снегу, робяць падзяляльныя палосы, раскідаюць пясок пры галалёдзе (лёгкія аўтагрэйдэры і планіроўшчыкі, паліваль ныя і ўборачныя машыны, маркіравальнікі, снегаачышчальнікі, пескараскідальнікі і інш.); ДС рыхтуюць, кладуць і ўшчыльняюць асфальтавыя ці бетонныя сумесі (грунтазмешвальныя машыны, *будранатары*, асфальтабетонаміксальныя, асфальтабетонаўкладчыкі, фрэзы дарожныя і інш.). На Беларусі работы па ўдасканаленні Д. м., стварэнні новых тыпаў, развіцці дарожнага машынабудавання вядуцца ў СКБ «Мелiярмаш», Бел. політэхн. і Магілёўскім маш.-буд. ін-тах, на *мінскім заводзе «Ударнік», Магілёўскім аўтамабільным заводзе*, Мазырскім з-дзе мелiярац. машын. Гл. таксама *Будаўнічыя машыны*.

Літ.: Хархута Н. Я. и др. Дорожные машины, Л., 1968.

І. І. Леановіч. Мінск.

ДАРОЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч (1.5.1924, в. Стара-Рагавое Ніжнедаявіцкага пав. Варонежскай губ.— 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1943. Вызначыўся 24—25.6.1944 у Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. Кулямётная рота Д. фарсіравала Зах. Дзвіну і суткі адбівала контратакі ворага. Загінуў у рукапашным баі.

ДАРОХІН Іван Мікітавіч (31.3.1924—25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся 24—25.6.1944. У баі за нас. пункт Святое Возера Гомельскай вобл. агнём гарматы знішчыў самаходную ўстаноўку «фердынанд», 3 процітанкавыя гарматы, 2 мінамётныя батарэі, 3 кулямёты. Загінуў у баі.

ДАРОШКА Валянціна Іванаўна (н. 8.1.1927, в. Паставічы Старадарожскага р-на Слуцкай акругі), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1951). Прац. дзейнасць пачала ў 1945 у калгасе «Дружба» Старадарожскага р-на Мінскай вобл. У 1949—51 звеніявая па вырошчванні кок-сагызу, з 1951 палявод гэтага калгаса.

ДАРТЫКО́С ТАРА́ДА (Dorticós Torrado) Асвальда (н. 17.4.1919, г. Сьенфуэгас), дзярж. і паліт. дзеяч Кубы. З сям'і ўрача. Д-р права

(з 1941). З 16 гадоў удзельнічаў у рэвалюц. барацьбе, за што пяраз арыштоўваўся. Пасля перамогі рэвалюцыі (студз. 1959) прызначаны міністрам рэвалюц. законнасці, адначасова выконваў абавязкі міністра эканомікі і міністра па пытаннях канфіскацыі маёмасці. З ліп. 1959 прэзідэнт рэспублікі. Чл. Палітбюро ЦК кампартыі Кубы.



ДАРЫ 1-я, вёска ў Магілёўскім р-не. Цэнтр сельсавета. За 11 *км* на ПдУ ад Магілёва, 3 *км* ад чыг. ст. Лупалава, каля шашы Магілёў — Чавусы (2 *км*). 255 ж., гасп. 85 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДАРЫЙ I, Дараявуш [522—486 да н. э.], персідскі цар дынастыі Ахеменідаў. Правёў шэраг адм.-гасп. рэформаў: падзяліў дзяржаву на ваен.-адм. акругі (т. зв. сатраніі), упарадкаваў падатковую сістэму і інш. Пры Д. I упершыню ў старажытнасці паявілася залатая манета (дарык). Вялося значнае буд-ва, расквітнеў міжнар. гандаль. Гэта быў час найбольшай магутнасці *Ахеменідаў дзяржавы*, перыяд аслаблення якой пачаўся пасля няўдалага паходу Д. I супраць скіфаў Паўн. Прычарнамор'я (каля 514 да н. э.). Пры ім пачаліся *грэка-персідскія войны* 500—449 да н. э.

ДАРЫЧНЫ ОРДЭР, адзін з трох асн. архітэктурных ордэраў, гл. *Ордэры*.

ДАРЭКТАР, вандроўны настаўнік, найчасцей падлетак, які скончыў пачатковую школу і вучыў вясковых дзяцей грамаце. У дарэктара ў дзіцячыя гады вучыўся грамаце Якуб Колас, які расказаў пра гэта ў паэме «Новая зямля» (раздзел «Дарэктар»).

ДАР-ЭС-САЛАМ, сталіца Аб'яднанай Рэспублікі Танзаніі. Засн. ў 1862. Порт на Індыйскім ак. (⅔ грузаабароту краіны), чыг. станцыя, аэрапорт. 272,5 тыс. ж. (1968). Апрацоўка с.-г. сыравіны. Ф-ка мясных кансерваў, з-д па вытв. кансервавых бляшанак і інш. метал. тары, 2 піўныя з-ды, некалькі млыноў, ф-кі тытунёвая і па вытв. папяровых мяшкоў, мылаварны і лакафарбавы з-ды, мэблевая і абутковая ф-кі. Фармацэўтычная прамысловасць, вытворчасць буд. матэрыялаў. Вываз копры, арахісу, сізалю, алмазаў, золата. Ун-т, этнаграфічны музей. Бат. сад.

ДАСКАЛОЎ Стаян Цэкаў (н. 22.8.1909, в. Ліляча Урачанскай акр.), балгарскі пісьменнік. Нар. дз. культ. НРБ (1967). Чл. БКП з 1944. Скончыў Шуменскі пед. ін-т і Сафійскі ун-т. Друкуецца з 1930. Першы зб. апавяданняў «Пакута» (1935). У раманах «Шлях» (кн. 1—3, 1945—54), «Млын Ліпаванскага» (1951), «Свая зямля» (1952), «Стубленскія ліпы» (1960), «Зямное святло» (1968), аповесцях і апавяданнях паказаў карэнныя перамены ў лёсе, побыце і псіхіцы балг. сялянства ў паслявераснёўскі час. Уражанні ад паездкі ў БССР у кн. «Па савецкай зямлі» (1959, разам. «Партызанскі край»). Дзімітроўская прэмія 1950 і 1969.

Тв.: Бел. пер.— Любча-безбілетнік. Апавяданні, Мн., 1959; Свая зямля, Мн., 1961; у кн.: Скарб, Мн., 1967; у час.— «Маладосць», 1959, № 10; «Беларусь», 1961, № 7; рус. пер.— Орденоносец, М., 1950; Три зерна, М., 1960; Первая дружба, М., 1963; Когда начинается любовь, М., 1966. *Н. С. Гілевіч.* Мінск.

ДАСОВІЧЫ, вёска ў Хонаўскім с/с Магілёўскага р-на. Цэнтр саўгаса «Дасовічы». За 27 *км* на ПдЗ ад Магілёва, 17 *км* ад чыг. ст. Дашкаўка, каля шашы Магілёў — Бабруйск (2 *км*). 150 ж., гасп. 66 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. У 1941 вёску часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАСТ (Дзяржаўны агульнасаюзны стандарт), гл. *Стандартызацыя*.

ДАСТАЕЎСКІ Фёдар Міхайлавіч [30.10(11.11).1821, Масква — 28.1(9.2).1881], рускі пісьменнік. Род Д. беларускага паходжання. У 1506 продкі Д. атрымалі грамату на с. *Дастоева* на Піншчыне. З сям'і лекара. Скончыў Пецярбургскае ваенна-інж. вучылішча (1843). Дэбютаваў перакладам рамана А. Бальзака «Яўгенія Грандэ» (1844). Першы раман Д. «Бедныя людзі» (1846) паставіў яго ў шэраг вядомых прадстаўнікоў *натуральнай школы*, быў высока ацэнены В. Бялінскім і М. Някрасавым. У 2-й пал. 40-х г. захапляецца ідэямі сацыялістаў-утапістаў, прымае актыўны ўдзел у гуртку М. Петрашэўскага, за гэта прыгаворваецца (1849) да пакарання смерцю, заменена-



га катаргай (адбывае ў Омску, 1850—54); потым праходзіць салдатчыну. На катарзе перажывае духоўны крызіс: траціць веру ў магчымасць перабудовы грамадства рэвалюц. шляхам. У той жа час абвастраецца яго ўспрымальнасць чалавечых пакут і трывога за лёс усяго чалавецтва. З 1859 у Пецярбургу. Друкуе творы «Дзядзечкаў сон» (1859), «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары» (1859), «Прыніжаныя і зняважаныя» (1861). У «Запісках з мёртвага дома» (1861—62) паказаў жахі катаргі. З братам Міхаілам (да 1864) выдае час. «Время» (1861—63) і «Эпоха» (1864—65), у якіх прапагандуе ідэі «почвенничества», варожыя рус. рэвалюц. дэмакраты. У 1863 піша «Зімовыя нататкі пра летнія ўражанні», у 1864 аповесць «Запіскі з падполля»; апошняя — вяха на шляху распрацоўкі Д. філас. рамана. Раманы «Злачынства і кара» (1866), «Ідыёт» (1868), «Падлетак» (1875), «Браты Карамазавы» (1879—80) адлюстравалі глыбокія супярэчнасці рус. рэчаіснасці і грамадскай думкі ў эпоху вялікіх сац. зрухаў у Расіі і Зах. Еўропе. Д. выказаў у іх бязмернасць пакут абяздоленага чалавека ў эксплуататарскім

грамадстве. Свет чалавечых пакут — аснова ўсёй рэаліст. творчасці Д. Пафас твораў — барацьба з арэчаўленнем чалавека, з нівеліроўкай і аблсцэньваннем асобы ва ўмовах капіталізму. Самыя вострыя праблемы часу Д. пераносіць у раманы, як у «лабараторныя» ўмовы, каб паказаць іх магчымы кірунак і вынік у маштабах усяго чалавецтва. Свядомасць гал. герояў Д.— заўсёды арэна барацьбы пунктаў погляду. Звычайна героі паказваюцца ў моманты крызісу, пералому (герой Д.— чалавек ідэі, непаўторнага светаўспрымання), калі ідэя авалодвае глыбінямі іх натуры, пераходзіць у моцнае пачуццё. У паказе адзеку з чалавечай годнасці, у перадачы самых тонкіх перажыванняў Д. дасягае незвычайных мастацкіх вышынь. У рамане «Злачынства і кара» адлюстраваў вялікія пакуты душы, якую мучыць гора ўсіх людзей, а таксама выкрыў буржуазны індывідуалізм, паказаў загнанасць, антычалавечнасць тэорыі «права моцнага». У гэтым рамане гранічная напружанасць думкі і філас.-псіхал. дыялогу; дыялог у творах Д. разгортваецца як споведзь герояў. У рамане «Ідыёт» цалкам прыгожы чалавек сутыкаецца з бесчалавечным грамадствам, раскрываецца трагічнае бяссілле героя перад амаралізмам і прагаю грошай, што нясе капіталізм. Вельмі моцна гучыць заўсёднае імкненне пісьменніка аберагчы веру ў чалавека і знайсці, увасобіць свой ідэал. Псіхалагізм Д. дасягае ў рамане поўнага росквіту. Адначасова Д. ідэалізуе пакору і ўзвышаныя пакуты, праводзіць ідэю маральнага самаўдасканалення на рэліг. аснове. Раман «Д'яблы» (1871—72), самы супярэчлівы твор Д.,— памфлет на рус. рэвалюц. дэмакратыю, якую ён беспадстаўна атаясамлівае з бурж. індывідуалізмам. Раман «Падлетак» пра драпежніцтва і маральны распад буржуазіі. Сінтэзам філас., сац. і псіхал. пошукаў Д. з'явіўся апошні раман «Браты Карамазавы». У ім ярка адбіўся жах Д. перад звярынай сутнасцю, разбэшчанасцю і эгаізмам бурж. чалавека, абвастрылася пакутлівае хістанне пісьменніка паміж ідэалізацыяй пакоры і бунтам супраць яе. Д. стварыў новы тып рамана, блізкага да трагічнага тэатра, які зрабіў уплыў на рус., бел. (К. Чорны) і на сусветны раман, адзейсніў т. зв. «поліфанію». Па сіле маст. майстэрства М. Горкі параўноўваў Д. з Шэкспірам. Для абароны ўпадніцкага мастацтва бурж. літаратуразнаўцы і філосафы імкнуцца выкарыстаць супярэчлівасць творчасці Д. і яго маст. метаду, многія модэрнісцкія кірункі вах. мастацтва лічаць Д. сваім папярэднікам. Яны акцэнтуюць увагу на тым, што не галоўнае ў яго творах, і замоўчваюць прагрэсіўнае, глыбока гуманістычнае. Хоць Д. сталў на рэакц. пазіцыях у многіх пытаннях (культ пакут, абарона рэлігіі як асновы маралі, нападкі на сацыялізм, матэрыялізм і атэізм М. Чарнышэўскага і інш.), ён, тым не менш, як і Л. Талстой, выявіў важныя тэндэнцыі грамадскага развіцця, змог паставіць праблемы сусв. значнасці. У 1928 у Маскве адкрыты музей Д. Творы Д. экранізуюцца і інсцэніруюцца («Прыніжаныя і зняважаныя», 1957; «Злачынства і кара», 1962; абодва ў т-ры імя Я. Коласа).

Тв.: Полн. собр. соч., под ред. А. Г. Достоевской, т. 1—21, СПб., 1911; т. 22—23, сост. Л. П. Гроссман, П., 1918; Собр. соч., т. 1—10, М., 1956—58; бел. пер.— Бедныя людзі, Мн., 1930.

Літ.: Ф. М. Достоевский в русской критике, М., 1956; Творчество Ф. М. Достоевского. [Зб. арт.], М., 1959; Вахтин М. М. Проблемы поэтики Достоевского, 2 изд., М., 1963; Гроссман Л. П. Достоевский, 2 изд., М., 1965; Фридлендер Г. М. Реализм Достоевского, М.—Л., 1964; Ф. М. Дастаеўскі — беларус, «Беларусь», 1945, № 11—12, с. 90—91; Кудрявцев Ю. Г. Бунт или религия (О мировоззрении Ф. М. Достоевского), М., 1969; Карякин Ю. Ф. Правда посюстороннего мира, «Вопросы философии», 1967, № 9; Ф. М. Достоевский. Библиогр. произв. Д. и лит. о нем. 1917—1965, М., 1968. *А. М. Адамовіч.* Мінск.

ДАСТАТКОВАЙ ПАДСТАВЫ ЗАКОН, закон фармальнай логікі, у адпаведнасці з якім усякае выказванне ў навуцы павінна грунтавацца на дастатковых падставах, у выніку якіх яно прызнаецца ісцінным.


Сфармуляваны Г. Лейбніцам у дадатак да *тоеснасці закону, супярэчнасці закону* і *выключанага трэцяга закону*. Мае аналогію з прычыннай залежнасцю аб'ектыўных з'яў. Калі ў аб'ектыўным свеце ўсякая з'ява, дзеянне і інш. маюць прычыну, то ў пазнанні ісціннасць усякай думкі павінна быць абгрунтавана, даказана. У дэдукцыйных разважаннях і творах за дастатковую падставу прымаецца даказанае выказванне або сукупнасць такіх, з якога або з якіх лагічна вынікае выказванне, што абгрунтоўваецца. Закон выражае ўласцівасць доказнасці лагічна правільнага мыслення. У аксіяматычных сістэмах і падобных да іх строгіх лагічных пабудаваннях Д. п. з. патрабуе забеспячэння даказальнасці выказванняў тэорыі, што разглядаюцца ў якасці ле тэарэм. Гл. таксама *Доказ і абвяржэнне, Вывад*.

Літ.: Гл. пры арт. *Фармальная логіка*.

ДАСТОЕВА, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоная зорка». За 16 *км* на ПнУ ад Іванава, 148 *км* ад Брэста, 19 *км* ад чыг. ст. Янаў-Палескі, на шашы, якая злучае вёску з Іванавам і Пінскам. 988 ж., дварoў 241 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, раздзільны дом, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік адначаскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Школьны музей Ф. М. Дастаеўскага, продкі якога жылі ў Дастоеве.

ДАТАЦЫЯ (ад лац. doto надаляю), від асігнаванняў з дзярж. бюджэту. У СССР выкарыстоўваецца для таго, каб збалансаваць даходы і расходы рэспубліканскіх і мясцовых бюджэтаў, а таксама пакрыць планавыя страты асобных прадпр. і ўстаноў. У капіталіст. краінах Д. даецца дзяржавай буйным манаполіям, асабліва тым, якія выконваюць ваен. заказы.

ДАТЧЫК, прылада для ператварэння велічыні, якая кантралюецца або рэгулюецца, у выходны сігнал, зручны для дыстанцыйнай перадачы і далейшага выкарыстання. Адна з асн. частак сістэм аўтаматыкі і тэлемеханікі, прызначаных для вымярэння, кантролю і рэгулявання фіз. велічынь і параметраў тэхнал. працэсаў. Д. ставяцца на самых аб'ектах, часта ў неспрыяльных умовах (агрэсіўныя асяроддзі, высокія ці пераменныя тэмпературы, ціск і г. д.).



Структурныя схемы датчыкаў (злева — блок-схемы, справа — прыклады выканання): *а* — найпрасцейшы від датчыка (тэрмапара); *б* — каскаднае злучэнне ператваральнікаў; *в* — дыферэнцыяльны датчык; *г* — кампенсацыйны датчык; *1* — успрымальная частка датчыка (адчувальны элемент); *1а* — тэрмапара; *1б* і *1г* — мембраны; *1в* — саленоідны індукцыйны датчык; *2* — выходны орган датчыка; *2б*, *3г* — індукцыйныя датчыкі; *3* — вымяральнік нязгоднасці велічынь (аднімальны элемент); *4* — узмацняльнік; *5* — генератар кампенсацыйнай велічыні; *5г* — магнітаэлектрычная сістэма; *6* — прамежкавы орган датчыка.

Параметры, якія ўспрымаюцца Д., бываюць механічныя (намаганне, перамяшчэнне, скорасць, вібрацыя); гідраўлічныя і пнеўматычныя (ціск, расход); аптычныя (сіла святла); цеплавыя (т-ра); электрычныя (напружанне і ток); радыеактыўныя. Выходныя сігналы Д. падзяляюцца: па відзе энергіі — на электрычныя і пнеўматычныя (часам гідраўлічныя), па характары мадуляцыі (змены) энергіі сігналу — на амплітудныя (напружанне, ток, ціск газу і інш.), часаімпульсныя, частотныя і фазавыя; па спосабе падачы ўспрымальнай велічыні — на аналогавыя (неперарыўныя) і лічбавыя (дыскрэтныя). Асн. характарыстыкі Д.: від функцыянальнай залежнасці паміж велічынёй уваходнай x і выходнай y [$y=f(x)$]; адчувальнасць $S=\frac{\Delta y}{\Delta x}$ і парог адчувальнасці (найменшая змена ўваходнай велічыні, якая выклікае змяненне выходнага сігналу); хібнасць. Д. складаецца з аднаго (напр., тэрмапара, тэрмометр супраціўлення, тэнзометр; гл. рыс. *а*) або з некалькіх злучаных у сістэму элементарных ператвараль нікаў. Найважнейшы з іх — адчувальны элемент. Ператваральнікі злучаюцца па каскаднай, дыферэнцыяльнай і кампенсацыйнай схемах. Каскаднай (рыс. *б*) дае магчымасць атрымаць выходны сігнал паслядоўным (шматразовым) ператварэннем уваходнага параметра. Пры дыферэнцыяльным злучэнні ператваральнікаў (рыс. *в*) патрабныя выходныя сігналы іх складаюцца (узмацняюцца), а шкодныя — аднімаюцца (аслабляюцца). Кампенсацыйныя Д. (рыс. *г*) заснаваны на ўраўнаважанні велічыні, што вымяраецца, інш. велічынёй таго ж роду. Такія Д. забяспечваюць найб. высокую дакладнасць вымярэнняў.

Літ.: Агейкин Д. И., Костина Е. Н. и Кузнецова Н. Н. Датчики контроля и регулирования, 2 изд., М., 1965; Марков Н. Н., Машинистов В. М. и Этингоф М. И. Электроконтактные датчики для линейных измерений, М., 1969; Кравцов Н. В. и Стрельников Ю. В. Позиционно-чувствительные датчики оптических следящих систем, М., 1969; Долгов В. А. и Келин А. В. Электронные датчики для автоматических систем контроля, М., 1968; Милохин Н. Т. Частотные датчики систем автоконтроля и управления, М., 1968; Удалов Н. П. Полупроводниковые датчики, М.—Л., 1965; Шевченко Г. И. Магнитоанизотропные датчики, М., 1967.

Я. П. Забела. Мінск.

ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ, вызваленне засуджанага ад адбывання пакарання. Адрозніваюць: *умоўна-датэрміновае вызваленне*, умоўнае вызваленне з накіраваннем на буд-ва прадпрыемстваў пар. гасп., вызваленне з прычыны хваробы, па *амністыі* або пры *памілаванні*.

Ажыццяўляецца судом; амністыя і памілаванне — толькі актамі вышэйшых органаў дзярж. улады. Накіраваныя на буд-ва карыстаюцца ўсімі правамі грамадзян, але на час незадбытага тэрміну пакарання ўводзяцца асобныя абмежаванні (напр., у месцы жыхарства). Псіхічна хворыя датэрмінова вызваляюцца па прапанове адміністрацыі папраўча-працоўнай установы на падставе заключэння ўрачэбнай камісіі. Суд можа накіраваць іх на прымусовае лячэнне ці перадаць пад нагляд органаў аховы здароўя. Пры Д. в. асоб, якія захварэлі на інш. цяжкую хваробу, суд улічвае іх грамадскую небяспеку, зробленае злачынства і інш. абставіны справы.

Літ.: Ткачевский Ю. М. Досрочное освобождение от наказания, М., 1962.

В. А. Шкурко. Мінск.

ДАЎТАЎ Іскандэр Садыкавіч (2.9.1923, чыг. ст. Ісількуль Омскага пав.— 27.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з кастр. 1942, кулямётчык. Вызначыўся ў Палескай вобл. 27.9.1943 фарсіраваў Дняпро каля Камарына, уварваўся ў варожыя траншэі. Загінуў у баі за плацдарм.

ДАЎБЕНІ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 8 *км* на ПдУ ад Валожына, 70 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Валожын, каля шашы Мінск — Валожын (2 *км*). 193 ж., двароў 56 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДАЎБЁННЕ (у тэхніцы), апрацоўка матэрыялаў (металаў, драўніны) зняццем стружкі разцом (даўбяком, долатам), які рухаецца зваротна-паступальна ў вертыкальнай плоскасці; робіцца на *даўбёжным станку*.

Літ.: Яковцов А. Д. Работа на строгальных и долбежных станках, 2 изд., М., 1971.

ДАЎБЕШКІН Пётр Лукіч [25.9(8.10).1912, в. Паўлавічы Віцебскага пав.— 3.10.1943], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС. Скончыў Віцебскі фіп.-эканам. тэхнікум (1934), Сумскую артыл. школу (1937). У Чырв. Арміі з 1934. Вызначыўся 22.9.1943 у баі за Дняпро на ПдЗ ад Пераяслава-Хмяльніцкага. Дывізіён мінамётнага палка на чале з Д. фарсіраваў раку, на захопленым плацдарме адбіў 8 варожых контратак. Загінуў у баі.



ДАЎБЁЖНЫ СТАНОК, металарэзны ці дрэваапрацоўчы станок для *даўбення*.

Металарэзны Д. с. падобны да *строгальнага станка*, але паўзун, у якім зацiскаецца разец (даўбяк), рухаецца вертыкальна. Дэталь, устаноўленая на стале, рухаецца паступальна ці вярчальна. Прывод паўзуна і стала механічны або гідраўлічны. Паводле прызначэння адрозніваюць Д. с. зубадаўбёжныя, шпаначна-даўбёжныя і даўбёжныя для пуансонаў. У параўнанні са станкамі бесперапыннага дзеяння (напр., фрэзернымі) менш прадукцыйныя; ужываюцца ў маласерыйнай вытворчасці. На дрэваапрацоўчых Д. с. робяць прамавугольныя пазы і канаўкі ў драўляных дэталях. У залежнасці ад канструкцыі рэзальнага інструмента адрозніваюць Д. с. свідравальна-даўбёжныя і ланцугова-даўбёжныя. На Беларусі металарэзныя Д. с. выпускаюць станкабудаўнічыя з-ды імя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Мінску (мадэль 745А, гл. рыс.) і імя Кірава ў Гомелі (мадэлі 7М-430, 7М-450).



Літ.: Гл. пры арт. *Даўбенне*.

ДАЎБЛІ, возера ў бас. р. Акунёўкі (бас. Друйкі), у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,53 *км*². Даўж. 3,9 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,4 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор (19,2 *км*²) узгорыста-марэнны, амаль увесь пад ворывам. Возера зарастае, сцёк вады ў р. Акунёўку. Водзяцца плотка, шчупак, акунь, мянтуз, лінь, лешч і інш.

ДАЎБЛІ, вёска ў Опсаўскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на паўн. беразе воз. Даўблі. Цэнтр калгаса «Запаветы Ільіча». За 17 *км* на ПдЗ ад Браслава, 247 *км* ад Віцебска, 56 *км* ад чыг. ст. Даўгаўпілс (Латв. ССР). 112 ж., гасп. 32 (1971). Клуб.

ДАЎБЭ Вальдэмар Пятровіч [16(28).2.1895, хутар Міле Вольмарскага пав. Ліфляндскай губ.— 12.10.1950], удзельнік Кастр. рэвалюцыі і грамадз. вайны на Беларусі. З сям'і парабка. Чл. КПСС з 1913. З 1911 працаваў на Віцебшчыне. З сак. 1918 ваен. камісар Віцебскай губ., чл. Віцебскага губкома РКП(б) і губвыканкома, з чэрв. 1918 камісар Смаленскай дывізіі (у Віцебску), камісар зводнага Віцебскага атрада, які ўдзельнічаў у ліквідацыі эсэраўскіх мяцяжоў у Оршы і Сяньне. З вер. 1918 камісар 1-й Магілёўскай, 24-й жалезнай дывізій, якія змагаліся з белагвардзейцамі на Усх. фронце. З ліп. 1919 нач. асобага аддзела Паўд. групы войск Усх. фронту, потым Туркестанскага фронту, 13-й арміі. У 1922—24 нач. Віцебскага губ. аддзела АДПУ. За арг-цыю разгрому савінкаўскіх і інш. бандаў на Віцебшчыне ўзнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Пазней да 1945 на кіруючых пасадах у органах АДПУ, НКУС, НКДБ. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 ордэнамі Чырв. Сцяга, медалямі.

І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак. Мінск.

ДАЎГАВУХАЯ БЕЛАЯ пародa свіней, парода мяса-сальнага кірунку, выведзеная ў Германіі ў 2-й пал. 19 ст. скрыжаваннем мясцовых свіней з буйной белай і каратказвухай белай. Зарэгістравана ў 1878. У СССР завезена ў 1932—33.

Масць белая, тулава доўгае, шырокае, галава з вялікімі абвіслымі вушамі, шчаціне белае, густое. Свінні неперабарлівыя, вынослівыя, добра прыстасаваныя да пашавага ўтрымання. Самка важыць 180—240, кныр 240—320, 9—10-месячны падсвінак (у мяса-сальнай кандыцыі) 140—180 *кг*. Плоднасць 9—11 парасят за апарос. Сярэдняя таўшчыня сала на спіне пры забоі ў 100 *кг* — 42,6 *мм*. Племянную прадукцыю дае племсаўгас «10 гадоў Кастрычніка» Чарнігаўскай вобл. На Беларусі выкарыстоўваюць для двухпароднага прамысл. скрыжавання з *буйной белай* пародай свіней і трохпароднага з буйной белай і *эстонскай беконнай* пародамі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Свінагадоўля*.

Літ.: Волкопялов Б. П. Свиноводство, 4 изд., Л., 1968; Руководство по разведению животных, т. 3, кн. 2, пер. с нем., М., 1965.

А. В. Купрыянава. Жодзіна.

ДАЎГАЛЁССЕ, вёска ў Гомельскім р-не. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя М. Горкага. За 35 *км* на ПдЗ ад Гомеля, 18 *км* ад чыг. ст. Якімаўка. 700 ж., двароў 220 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, урачэбная амбулаторыя, аддз. сувязі, сталовая, швейная і шавецкая майстэрні, магазін. Помнік на брацкай магіле 6 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДАЎГАЛЁЎСКІ Мітрафан (Міхаіл; г. н. і см. невяд.), украінскі і беларускі пісьменнік і культурны дзеяч 1-й пал. 18 ст. Вучыўся ў Кіева-Магілянскай акадэміі. Пастрыгшыся ў манахі (пад імем Мітрафан), стаў (1733) выкладчыкам гэтай акадэміі (у 1736—37 праф. паэтыкі). Аўтар панегірыкаў, курсу паэтыкі (1736, на лац. мове), школьных драм «Комическое действие» (1736) і «Властотворный образ...» (1737). Інтэрмедыі да гэтых драм маюць бытавы і сац. характар. Лепшыя з іх пра барацьбу ўкраінцаў і беларусаў з польскімі панамі. Зместам і мовай паасобныя інтэрмедыі ўкраінска-беларускія. Магчыма, што яны напісаны пад кіраўніцтвам Д. студэнтамі-беларусамі Кіева-Магілянскай акадэміі.

ДАЎГАЛЕЦЦЕ, жыццё чалавека, якое перавышае сярэднюю яго працягласць. Даўгалетнімі называюць людзей, якім больш за 80 гадоў, даўгавечнымі (макрабіётамі) тых, каму больш за 90 гадоў. СССР — краіна высокага Д. Значна павялічылася працягласць жыцця ў БССР (73 гады ў 1968—69 супраць 37,5 года ў 1896—97 і 44 гадоў у 1926—27) і колькасць людзей ва ўзросце больш за 70 гадоў (у 1969 было 5,8% ад усяго насельніцтва супраць 4,5% у 1959). 1058 чал. (паводле перапісу 1959) дасягнулі ўзросту болей за 100 гадоў. Многія даўгавечнікі маюць добрую памяць, цікавасць да навакольнага свету і ў значнай ступені працаздольнасць. Праблемы Д. і *старэння* вывучае *геранталогія*.

Спрыяюць Д. сац.-эканам. ўмовы, матэрыяльны дабрабыт працоўных, высокі ўзровень грамадскай санітарыі, аховы здароўя, пэўныя псіхічныя і маральныя перадумовы, фіз. праца, рэжым харчавання, спадчыннасць. Неўжыванне тытуню і алкаголю таксама спрыяе Д. У с. Барзаву Лерыкскага р-на Азерб. ССР жыве 165-гадовы Ш. К. Муслімаў. На Беларусі найстаражытнае жыхарка — Ф. Ф. Аўтушка (в. Пераходцы Лепельскага р-на Віцебскай вобл.), якой у 1970 споўнілася 105 гадоў.

Літ.: Раков А. А. Население БССР, Мн., 1969; гл. таксама літ. пры арт. *Геранталогія, Старэнне*.

Г. Р. Гацко. Мінск.

ДАЎГАНОЖКІ (Tipulidae), сямейства атр. двухкрылых насякомых. Вядома каля 2500 відаў, пашыраных у Еўропе, Сярэдняй Азіі, Паўн. Афрыцы. У СССР каля 200, у БССР каля 40 відаў.

Галава маленькая, цела вузкае, даўж. да 4 *см*, ногі доўгія, тонкія, вусікі шматчленікавыя, на

спінцы У-падобнае шво. Лічынкі цыліндрычныя, бязногія, з патоўшчаным заднім канцом; жывуць у сырой глебе, вадзе, трухлявай драўніне; жывяцца тканкамі раслін. На Беларусі найб. шкодная балотная Д. (Tipula paludosa), псуе шматгадовыя травы, лён, каноплі, збожжавыя, агародныя культуры. Меры барацьбы: меліярацыя сырых мясцін паніжэннем узроўню грунтавых водаў і інш.



Балотная даўганожка.

Літ.: Определитель насекомых Европейской части СССР, т. 5, ч. 1, Л., 1969; Кипенварлиц А. Ф. Изменение почвенной фауны низинных болот под влиянием мелиорации и сельскохозяйственного освоения, Мн., 1961; Запольская Т. І. Балотная даўганожка і меры барацьбы з ёю, «Весці АН БССР. Сер. сельскагаспадарчых навук», 1964, № 1.

ДАЎГАНОСІКІ, слонікі (Curculionidae), сямейства атр. жукоў. Даўж. цела 0,7—25 *мм*. Пярэдняя частка галавы выцягнута ў хабаток (галаваструбка). Вядома каля 35 тыс. відаў, у СССР больш за 3500.

Падзяляюцца на даўгахобатных і каратказобатных. Расліннаедныя, радзей сапрафагі. Лічынкі звычайна бязногія, белыя, з жоўтай ці карычневай галавою, сляпыя (жывуць у глебе) або з парай вочак (жывуць у пладах, драўніне і ў кошыках суквецця). Жукі і лічынкі псуюць карані, сцяблы, лісце, драўніну, кветкі, плады. На Беларусі асабліва шкодзяць бабовым культурам клубеньчыкавыя Д. (Sitona), капюшынныя насенняеды (Apion) і інш. Асн. метады барацьбы хімічныя і агратэхнічныя. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Жукі*.

Літ.: Гарбунова Н. Н. Шкоднікі лубіну, Мн., 1957; Іёанісіяні Т. Г., Бірг А. В. і Лаўрова Н. К. Матэрыялы па відавому саставу і экалогіі жукоў-слонікаў (Coleoptera, Curculionidae) Беларусі, «Весці АН БССР. Сер. біялагічных навук», 1963, № 4. *Н. М. Гарбунова.* Жодзіна.

ДАЎГАПОЛЛЕ, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., на р. Чарноўка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Даўгаполле». За 16 *км* на ПнЗ ад Гарадка, 48 *км* ад Віцебска, 18 *км* ад чыг. ст. Гарадок. 540 ж., гасп. 113 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Школа-інтэрнат, клуб, магазін.

ДАЎГАПЯТЫ, падатрад млекакормячых атр. прыматаў. Гл. *Малпы*.

ДАЎГАРУКІЯ МАЛПЫ, гл. *Гібоны*.

ДАЎГАЎПІЛС (да 1893 Дынабург, да 1920 Дзвінск), горад рэсп. падпарадкавання ў Латв. ССР. Вузел чыг. і шашэйных дарог, прыстань на Даўгаве (Зах. Дзвіне). 101 тыс. ж. (1970). З-ды: хім. валакна, лакаматываремонтны, «Электраінструмент», мотавелаланцугоў, аўтарамонтны, жалезабетонных канструкцый, буд. матэрыялаў і канструкцый, ільнозавод, кансервавы. Камбінаты мяса-малочны і абутковы «Даўгава». Пед. ін-т, філіял Рыжскага політэхн. ін-та; тэхнікумы чыг. транспарту і механічны, муз. і мед. вучылішчы. Краязнаўчы і маст. музеі, тэатр.

Засн. ў 1274 лівонскімі рыцарамі як крэпасць. У Лівонскую вайну 1558—83 разбураны Іванам IV Грозным (1577). У 1656 заняты рус. войскам і перайменаваны ў Барысаглебаў (Барысаглебск). З 1667 у складзе Рэчы Паспалітай, з 1772 — Расіі. З 1777 цэнтр павета Полацкай, з 1802 — Віцебскай губ. У 1810—32 пабудавана крэпасць (абвалілася). Паводле перапісу 1897 у Д. 72 231 ж. З 1920 у складзе бурж. Латвіі, з 1940 — Латв. ССР. У Вял. Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (26.6.1941—27.7.1944).

Літ.: Штейман И., Музыкантик Я. и Пакалнис Я. Даугавпилс в прошлом и настоящем, Рига, 1959.

ДАЎГАХВОСТЫ ПАМОРНІК (Stercorarius longicaudus), птушка сямейства чаек атр. чайкавых. Пашыраны на астравах паўн. мораў і ў тундрах. На Беларусі выпадкова залётны від.

Даўж. цела Д. п. 510—635 *мм*, асабліва доўгія цэнтр. пёры хваста (260—355 *мм*, адсюль назва), маса каля 300 *г*. Пералётны. Жыве парамі. Гняздо — ямка ў сухім месцы, выслана мохам. Нясе 1—3 яйцы. Корміцца пераважна лемінгамі.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ДАЎГЕ Павел Георгіевіч [10(22).8.1869, Саўкаская вол. Фрыдрыхштацкага пав. Курляндскай губ.— 2.9.1946], адзін з заснавальнікаў латышскай с.-д. рабочай партыі, гісторык і публіцыст; заснавальнік сав. стаматалогіі. Д-р мед. н. (1935). Засл. дз. культуры Латв. ССР (1945). З сям'і настаўніка. Чл. КПСС з 1903. Скончыў Маскоўскі ун-т (1897). Удзельнік рэвалюц. руху з 1894. У 1918—29 у Наркамаце аховы здароўя РСФСР, пасля на навук. рабоце. Аўтар прац па стаматалогіі і гісторыі рэвалюц. руху ў Латвіі.

Тв.: Мои воспоминания, «Пролетарская революция», 1928, № 11—12; Социальные основы советской стоматологии, М., 1933; Революция 1905—1907 гг. в Латвии, Рига, 1949.

Літ.: Липовецкая Л., П. Г. Дауге — врач-революционер и выдающийся организатор советского здравоохранения, у кн.: Из истории медицины, [т.] 6, Рига, 1964.

ДАЎГІНАВА, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Даўгінава». За 47 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 148 *км* ад Мінска, 18 *км* ад чыг. ст. Крывічы. Аўтобусная ст. на скрыжаванні шашэйных дарог Вілейка — Докшыцы і г. п. Крывічы — в. Жардзяжка. 1477 ж., гасп. 501 (1971). Пякарня, каўбасны цэх, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі-сад, аддз. сувязі, 8 магазінаў. Помнік 67 сав. воінам, партызанам і грамадзянам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАЎГІНАВА, вёска ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., на р. Мёрыца. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Чапаева. За 17 *км* на ПнУ ад Міёраў, 207 *км* ад Віцебска, 19 *км* ад чыг. ст. Міёры, каля шашы г. п. Міёры — Верхнядзвінск (3 *км*). 83 ж., гасп. 38 (1971). Клуб, б-ка, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДАЎГІНАЎСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ РСДРП (Вілейскі пав. Віленскай губ.), узнікла ў 1905, узначальвалася «сходам» (9 чал.), які для кіраўніцтва штодзённай работай выбіраў «цэнтр» (4 чал.). Уваходзіла ў *Смаргонскую акруговую арганізацыю РСДРП*; у жн. 1906 налічвала 80 чл. Пры Д. а. РСДРП існавала сялянская арг-цыя (50 чал., з іх 10 чл. РСДРП), праз якую вялася агітац. і арганіз. работа ў 13 вёсках, у мяст. Крайск быў гурток з 13 чал. Распаўсюджвала выданні Мінскай і Віленскай арг-цый, абласнога к-та Паўн.-Зах. саюза РСДРП, у 1906 выдала 4 праклямацыі для сялян, 1 для рабочых. Пад уплывам бальшавіцкай агітацыі ў ліст. 1905 сяляне Даўгінаўскай вол. секлі памешчыцкі лес; 17.12.1905

каля 1000 сялян у мяст. Даўгінава каламі разагналі паліцыю, збілі спраўніка, сарвалі з дзярж. устаноў шыльды з царскімі арламі, правялі мітынг. Летам 1906 адбыліся забастоўкі падзённічыкаў, у выніку якіх аплату працы павялічылі на 40—50%. Д. а. РСДРП разгромлена ў час наступлення рэакцыі.

Літ.: Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962, с. 280—281; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962.
К. І. Шабуня. Мінск.

ДАЎГМАЛЕ, гарадзішча позняга жалезнага веку і ранняга сярэдневякоўя (1-е тысячагоддзе да н. э.— 13 ст.) у Латв. ССР. Размешчана на левым беразе Зах. Дзвіны (Даўгавы). Знойдзеныя пры раскопках рэчы (арабскія манеты, зброя, вагі з гірамі, упрыгожанні і інш.) даюць падставу сцвярджаць, што Д. спачатку было заселена земгаламі, потым лівамі і латгаламі, з'яўлялася вял. рамесным і гандл. цэнтрам, мела сувязі з Руссю, Скандынавіяй, Зах. Еўропай і з насельніцтвам, якое жыло на Пн Беларусі.

ДАЎГЯЛА Алег Георгіевіч (н. 1.5.1930, Полацк), беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1968). Чл. КПСС з 1958. У 1955 скончыў Мінскі мед. ін-т. Працаваў урачом у Гродзенскай вобл. Дацэнт кафедры факультэцкай тэрапіі Мінскага мед. ін-та (з 1968). Асн. працы па змены ў печані ад ачаговай пнеўманіі, па вітаміны A, B_1, B_6, C, E і іх дзеянне на мышцу сэрца ў хворых з недастатковасцю кровазвароту.

Тв.: (Разам з Мережынскім М. Ф. і Гарбачовым У. В.) Обмен витаминов С, B_1, B_6, РР, А, Е и их значение в терапии сердечно-сосудистых заболеваний, у кн.: Материалы симпозиума «Витамины при сердечно-сосудистых заболеваниях», М., 1969.

ДАЎГЯЛА Георгій Хрысанфавіч [н. 26.11(9.12).1902, Віцебск], беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1955), праф. (1956), засл. дз. нав. БССР (1966). Скончыў БДУ (1928). Працаваў урачом у Віцебскай вобл. (1929—35), асістэнтам кафедры шпітальнай тэрапіі Віцебскага мед. ін-та (1935—41). Удзельнік Айч. вайны. У 1946—53 дацэнт, з 1955 загадчык кафедры шпітальнай тэрапіі Мінскага мед. ін-та. Гал. тэрапеўт Мін-ва аховы здароўя БССР (1953—59). Асн. працы па гематалогіі, кардыялогіі, рэўматалогіі, атэрасклерозе, хранічных пнеўманіях. Прапанаваў і ўкараніў у практыку спосаб лячэння хворых на анемію Адысана — Бірмера пералівання эрытрацытарнай масы. Даказаў эфектыўнасць эмбіхіну і поўэмбіхіну пры лячэнні лімфагрануламатозу і лейкозаў. Старшыня Навук. т-ва ўрачоў-тэрапеўтаў БССР (з 1953). Чл. прэзідыума т-ва тэрапеўтаў СССР (1961). Узнаг. ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Злокачественное малокровие, 2 изд., Мн., 1962; (разам з Крыжаноўскім У.) Практическое руководство по исследованию свертывающей системы крови в клинике, Мн., 1969.

ДАЎГЯЛА Дзмітрый Іванавіч [20.10(1.11).1868, в. Казьяны Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.— крас. 1942], беларускі савецкі гісторык, археограф, крыніцазнаўца. З сялян. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1894). З 1897 працаваў у Віцебскім, потым Віленскім цэнтр. архівах стараж. грамат, з 1912 старшыня *Віленскай камісіі* для разбору і выдання стараж. актаў, з 1921 заг. Магілёўскага архіва, з 1925 супрацоўнік Інбелкульта, з 1929 дырэктар б-кі АН БССР, з 1937 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. Аўтар прац па гісторыі гарадоў Беларусі часоў феадалізму, удзельнік выдання «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў...» (т. 27—32) і «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі» (т. 31—35, 38—39), адзін з складальнікаў «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (т. 1, 1936).



Тв.: З беларускага пісьменства XVII ст., Мн., 1927; Заслаўе на Міншчыне, «Запіскі Аддзела гуманітарных навук Інбелкульта», 1928, кн. 5; Літоўская метрыка і яе каштоўнасць для вывучэння мінуўшчыны Беларусі, Рыга, 1933.
З. Ю. Капыскі. Мінск.

ДАЎГЯЛЫ, вёска ў Паляцкішскім с/с Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 12 *км* на ПнЗ ад Воранава, 145 *км* ад Гродна, 20 *км* ад чыг. ст. Бастуны, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Воранавам. 98 ж., гасп. 39 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДАЎЖАНКА, рака, правы прыток Друці (бас. Дняпра). Даўж. 37 *км*. Цячэ ў Бялыніцкім і Клічаўскім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (272 *км*²) плоска-хвалісты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 1,55 *м*³/*сек*.

ДАЎЖЫНЯ СВАБОДНАГА ПРАБЕГУ, λ, адлегласць, што праходзіць мікрачасцінка (малекула, атам, элементарная часцінка) паміж двума паслядоўнымі сутыкненнямі з інш. часцінкамі.

Сярэднюю Д. с. п. малекул газу можна прыблізна вылічыць па формуле $\bar{\lambda} = 1/n\pi d^2\sqrt{2}$, дзе n — колькасць малекул у адзінцы аб'ёму, d — эфектыўны дыяметр малекулы, роўны суме радыусаў малекул, што сутыкаюцца. Пры нармальных умовах сярэдняя Д. с. п. малекул паветра роўнае $7 \cdot 10^{-6}$ см, пры памяншэнні ціску ці награвanні газу яна павялічваецца. Паняццем Д. с. п. карыстаюцца ў розных галінах фізікі.

ДАЎЖЭНКА Аляксандр Пятровіч [30.8(11.9).1894, Сосніца Чарнігаўскай губ.— 25.11.1956], савецкі рэжысёр і драматург кіно. Народны арт. РСФСР (1950). З 1926 працаваў у кіно. Першыя фільмы: «Сумка дыпкур'ера» (1927), «Звінігара» (1928), «Арсенал» (1929), «Іван» (1932), «Аэраград» (1935). Фільм Д. «Зямля»



(1930) названы крытыкамі Брусельскага міжнар. кінафестывалю (Мкф) 1958 у ліку лепшых 12 карцін усіх часоў і народаў. Этапныя фільмы Д. «Шчорс» (Дзярж. прэмія СССР 1941) і «Мічурын» (Дзярж. прэмія СССР 1949, прэмія 4-га Мкф у Марыянске-Лазне ў Чэхаславакіі). Паставіў дакумент. фільмы «Вызваленне» (1940), «Бітва за нашу Савецкую Украіну» (1943) і інш. Па сцэнарыях Д. пастаўлены Ю. Сонцавай фільмы: «Песня пра мора» (1958, Ленінская прэмія 1959, пасмяротна), «Аповесць палымяных гадоў» (1961), «Зачараваная Дзясна» (1965). Фільмы Д. філасофскія, рамантычна прыўзнятыя, паэтычныя, з метафарычнасцю кінамовы, блізкія да традыцый укр. фальклору. Імя Д. прысвоена Кіеўскай кінастудыі маст. фільмаў. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М., 1966—69.

Літ.: Марьямов А. Довженко, М., 1968 (Жизнь замечательных людей).

ДАЎКАНТАС (Daukantas) Сіманас [17(28).10.1793, Цяльшэўскі пав. Ковенскай губ. — 24.11(6.12).1864], літоўскі гісторык і пісьменнік-асветнік. З сялян. Скончыў Віленскі ун-т (1825). Выкрываў рэакц. ролю каталіцкай царквы, якая садзейнічала набегам тэўтонскіх рыцараў на Літву. Складаў слоўнікі літоўскай мовы, намагаў збіраць і друкаваць літоўскі фальклор. Аўтар прац па гісторыі і гісторыі культуры Літвы («Гісторыя Літвы з старажытных часоў», «Дзеянні старажытных літоўцаў і жамайтаў» і інш.). Гісторыю літоўскага народа асвятляў з ідэаліст. пазіцый.

Літ.: Очерки по истории философской и общественно-политической мысли народов СССР, т. 2, М., 1956.

ДАЎЛЕТАЎ Абдурауф Ганіевіч (1916, в. Халілава Верхняўральскага пав. Арэнбургскай губ.— 27.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Канд. у чл. КПСС. На фронце з 1943, камандзір узвода. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Упачы па 27.9.1943 фарсіраваў Дняпро, кулямётным агнём садзейнічаў пераправе інш. воінаў. Загінуў у баі за плацдарм. Пахаваны ў в. Асарэвічы Брагінскага р-на Гомельскай вобл.

ДАЎЛЕТАЎ Баян Еркеевіч (8.3.1924, с. Тат-Азібей Мензелінскага пав. Казанскай губ.— 21.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. Стралк. ўзвод Д. знішчыў некалькі агнявых кропак праціўніка, гэтым памог батальёну вызваліць в. Бывалькі. Памёр ад ран. Пахаваны ў в. Бывалькі Лоеўскага р-на Гомельскай вобл.

ДАЎЛЕТДЖАНАЎ Берды Мурат (н. 1.1.1921, аул Мульк Сычмаз Мервскага пав. Закаспійскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1941. Чл. КПСС з 1946. Вызначыўся ў Палескай вобл. У вер. 1943 фарсіраваў Дняпро каля Камарына і ў баі на подступах да в. Усохі знішчыў мінамётны разлік праціўніка, расчысціўшы шлях для наступлення свайму эскадрону. Жыве ў г. Мары Туркм. ССР.

ДАЎЛЯДЫ, вёска ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл., на правым беразе Прыпяці. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Прыпяць». За 52 *км* на ПдУ ад Нароўлі, 160 *км* ад Гомеля, 20 *км* ад чыг. ст. Янаў (УССР), каля шашы Хойнікі — Оўруч (УССР; 0,5 *км*). 442 ж., двароў 160 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Брацкая магіла 28 сав. грамадзян, загубленых ням.-фаш. захопнікамі.

ДАЎЛЯТАЎ Бакір Рахімавіч [н. 10(23).5.1915, в. Старое Аміра Уфімскага пав.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1945. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Палескай вобл. пры фарсіраванні Дняпра. 29.9.1943 у баі за в. Галкі Камарынскага р-на кулямётным агнём памог свайму эскадрону вызваліць вёску. Жыве ў г. Рэгар Таджыкскай ССР.

ДАЎМАН Анс Эрнеставіч [14(26).11.1885, хутар Крэйпі Рыжскага пав.— 2.8.1920], дзеяч рэвалюц. руху ў Латвіі, герой грамадзянскай вайны. З сялян. Чл. КПСС з 1903. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. З 1914 на фронце. Пасля Лют. рэвалюцыі чл. выканкома, пасля Кастр. рэвалюцыі старшыня Нарвенскага Савета. У час наступлення ням. войск (люты — сак. 1918) камандзір Нарвенскага партыз. батальёна, камісар Гатчынскай дыв. Удзельнік вызвалення Латвіі ад ням. і белагвардзейскіх войск, чл. РВС арміі Сав. Латвіі. У жн.— кастр. 1919 узначальваў абарону Дзвінскага ўмацаванага раёна. З кастр. 1919 чл. РВС 16-й арміі, якая размяшчалася на Беларусі. З чэрв. 1920 камандзір 10-й стралк. дывізіі, якая вызваліла ад польскіх акупантаў Ігумен, Пухавічы, Клецк, Картуз-Бярозу, Кобрын, Брэст. Узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга. Пахаваны ў Мінску. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Барысаве, Нарве, завод на ст. Обаль Полацкага р-на.



Літ.: Кондратьев Н. Человек долга, М., 1966. *М. І. Каміскі.* Мінск.

ДАЎНАРЫ, вёска ў Бакштаўскім с/с Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Іскра». За 28 *км* на У ад Іўя, 186 *км* ад Гродна, 15 *км* ад чыг. ст. Юрацішкі, каля шашы в. Бакшты — г. п. Юрацішкі (1 *км*). 155 ж., гасп. 48 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДАЎНАСЦЬ (у праве), вызначаны законам тэрмін, на працягу якога магчыма прымусовае ажыццяўленне парушанага права, прыцягненне да адказнасці.

У сав. грамадз. праве вызначаны тэрміны Д.: 3 гады па патрабаваннях, у якіх адным з бакоў з'яўляецца грамадзянін; 1 год па спрэчках паміж дзярж. арг-цыямі, калгасамі і інш. кааператыўнымі і грамадскімі арг-цыямі. У некат. выпадках заканадаўствам прадугледжаны скарочаныя тэрміны іскавай Д. Змяняць працягласць тэрмінаў Д. пагадненнем бакоў не дапускаецца. Тэрмін іскавай Д. пачынаецца з дня ўзнікнення права на іск (калі асоба даведалася або павінна была даведацца пра парушэнне свайго права). Д. ужываецца да іскаў, якія разглядаюцца судом, арбітражам ці трацейскім судом, а таксама таварыскім судом, прафсаюзнай ці інш. грамадскай арг-цыяй. Пасля заканчэння Д. па нядзеяздольнасці прычыне прымусова ажыццяўляць парушанае права звычайна нельга. У сав. крымін. праве працягласць тэрміну прыцягнення да крымін. адказнасці і выканання абвінаваўчага прыгавору залежыць ад цяжкасці зробленага злачынства. Паводле арт. 46 КК БССР тэрміны Д. наступныя: 1 год, калі злачынствы невялікай грамадскай небяспекі; 3 гады, калі за злачынствы можа быць назначана пазбаўленне волі не больш як на 2 гады, ссылка або высылка; 5 гадоў, калі за злачынствы можа быць назначана пазбаўленне волі не больш як на 5 гадоў; 10 гадоў, калі за злачынствы можа быць назначана пазбаўленне волі больш як на 5 гадоў. Адпаведна вызначаны тэрміны Д. выканання абвінаваўчага прыгавору (1, 3, 5 і 10 гадоў). Д. ужываецца, калі вінаваты за гэты час не зробіць новага злачынства, за якое можа быць назначана пазбаўленне волі больш як на 2 гады, і калі вінаваты не хаваўся ад следства або суда. Паводле міжнар. дагавораў Д. не ўжываецца да *военных злачынстваў*.

Літ.: Кириллова М. Я. Исковая давность, М., 1966; Новицкий И. Б. Сделки. Исковая давность, М., 1954; Загороднико в Н. Давность уголовного преследования и ее сроки, «Социалистическая законность», 1967, № 2; Ефимов М. Давность привлечения к уголовной ответственности, «Советская юстиция», 1967, № 8.

И. І. Катаржынская, Э. А. Сяркісава. Мінск.


ДАЎЭСА ПЛАН, рэпарацыйны план для Германіі, распрацаваны міжнар. камітэтам экспертаў на чале з амер. банкірам Ч. Даўэсам. Зацверджаны 16.8.1924 Лонданскай канферэнцыяй прадстаўнікоў краін-пераможцаў у 1-й сусв. вайне і Германіі.

Паводле Д. п. рэпарацыйныя абавязацельствы Германіі скарачаліся, былі вызначаны памеры штогадовых плацяжоў. Для стабілізацыі валюты Германія атрымлівала пазыку ў 200 млн. дол., у т. л. 110 млн. долараў ад амер. банкаў. Меркавалася, што паток герм. тавараў хлынe ў Сав. Саюз і гэтым падарве сацыяліст. індустрыялізацыю і аслабіць абараназдольнасць СССР. Д. п. забяспечыў шырокі прыток замежнага, перш-наперш амер., капіталу ў герм. эканоміку. Да вер. 1930 замежныя капіталаўкладанні ў Германіі дасягнулі 26—27 млрд. марак, а агульная сума герм. рэпарацыйных плацяжоў за той перыяд склала крыху больш за 10 млрд. марак. Гэта садзейнічала аднаўленню герм. ваен.-прамысл. патэнцыялу і ператварэнню Германіі ва ўдарную сілу для барацьбы супраць рэвалюц. руху ў Еўропе, асабліва супраць СССР. У 1929—30 Д. п. заменены *Юнга планам*.

Публ.: План Дауэса. Финансовое восстановление Германии. Доклад комиссии Дауэса, М., 1925.

Літ.: Варга Е. План Дауэса и мировой кризис 1924 года, пер. с [венг.], М., 1925; Постников В. В. США и даусизация Германии (1924—1929 гг.), М., 1957.

ДАФНІІ, вадзяныя блохі (Daphnia), род рачкоў падатр. галінавусых. 26 відаў, пашыраных па ўсім зямным шары, акрамя палярных абласцей; у СССР — 14, на Беларусі 6 відаў.



Будова дафніі: *1* — антэны; *2* — фасетачнае вока; *3* — кішэчнік; *4* — сэрца; *5* — лечнік.

Даўж. 1—5 *мм*. Орган перамяшчэння — 2-я пара вусікаў. Раздзельнаполыя. Жывуць у стаячых і з павольнай плынню вадаёмах. Кормяцца Д. маляўкі, акварыумныя і многія прамысловыя рыбы. Д. прамежкавыя гаспадары некат. нематод, якія паразітуюць у вадаплаўных птушак.

ДАХ, верхняя агараджальная канструкцыя будынка, якая засцерагае яго ад атмасферных ападкаў, ветру, страты цяпла. Звычайна складаецца з нясучых элементаў (фермы, кроквы) і пакрыцця ў *дахавых матэрыялаў*. Ёсць канструкцыі, якія спалучаюць нясучыя і агараджальныя функцыі (купалы, скляпенні). Д. з саломы звуўся страхой.

ДАХАВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ, будаўнічыя матэрыялы, якія ідуць на дахі будынкаў.

Павінны быць водапранікальныя, мароза- і вільгацеўстойлівыя, трывалыя, лёгкія. Падзяляюцца на сілікатныя, арганічныя і металічныя. Адрозніваюць пруткія і гнуткія (рулонныя) матэрыялы. Сілікатныя: азбестацементавыя хвалепадобныя лісты і плітні, гліняная і цэментава-пясчаная *чарапіца, шыфер*; арганічныя трох відаў: матэрыялы з драўніны (драніцы, гонты), бітумінозныя *(руберойд, пергамін, толь)* і на аснове пластмас (плоскія і хвалепадобныя плиты з шклопластыкаў, брызол); металічныя — дахавая бляха (ацынкаваная і неацынкаваная). Д. м. выпускаюць многія прадпрыемствы БССР. Гл. *Будаўнічыя матэрыялы прамысловасць, Будаўнічыя матэрыялы.*

ДАХАЎ (Dachau), горад у Баварыі, непадалёку ад Мюнхена. За 2 *км* ад яго ў 1933 гітлераўцы стварылі канцэнтрацыйны лагер для антыфашыстаў. У ім па-зверску закатавана і загублена больш за 66 000 патрыётаў Германіі і вязняў з часова акупаваных гітлераўскімі захопнікамі ў 2-ю сусв. вайну тэрыторый, у т. л. больш як 7 тыс. савецкіх ваеннапалонных. Тысячы зняволеных загінулі ад злачынных, т. зв. «медыцынскіх эксперыментаў». 28.4.1945 антыфашысты арганізавалі паўстанне і сарвалі фаш. план знішчэння вязняў Д.

Літ.: СС в действии. Документы о преступлениях СС, пер. с нем., М., 1960, с. 280—283.

ДАХЛОЎКА, рака, правы прыток Мухаўца (бас. Буга). У верхнім цячэнні наз. Гарадзечна. Даўж. 24 *км*. Цячэ ў Пружанскім і Кобрынскім р-нах Брэсцкай вобл. Вадазбор (226 *км*²) — плоская забалочаная раўніна. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,84 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ДАХНАРСКАЕ, возера ў бас. р. Дахнаркі, левага прытока Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,5 *км*². Даўж. 0,8 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,6 *км*. Катлавіна круглявая. Вадазбор (84 *км*²) паката-хвалісты, марэнны. Праз возера працякае р. Дахнарка. Водзяцца плотка, лешч, акунь, шчупак і інш.

ДАХОДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА, гл. *Рэальныя даходы насельніцтва.*

ДАЦКАЯ ВАЙНА 1864 (аўстра-дацка-пруская вайна), вайна Прусіі ў саюзе з Аўстрыяй супраць Даніі за ўладу над герцагствамі Шлезвіг і Гольштэйн.

Зачэпкай была новая дацкая канстытуцыя 1863, паводле якой Шлезвіг далучыўся да Даніі. Данія адхіліла ультыматум Прусіі і Аўстрыі аб аднаўленні ранейшага статусу Шлезвіга (асабістая унія з Даніяй). 1.2.1864 аўстра-прускія войскі пачалі ваен. дзеянні і акупавалі вялікую частку тэр. Даніі. 30 кастр. быў падпісаны Венскі мір 1864, паводле якога Шлезвіг, Гольштэйн і Лаўэнбург абвяшчаліся сумесным уладаннем Прусіі і Аўстрыі. Для Германіі гэта была першая з шэрагу войнаў за аб'яднанне дробных ням. дзяржаў у адзіную герм. дзяржаву на чале з Прусіяй.

Літ.: Роотс Л. Шлезвиг-гольштинский вопрос и политика европейских держав в 1863—1864 годах, Таллин, 1957.

ДАЦКАЯ КАРАЛЕЎСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК І ЛІТАРАТУР, вышэйшая навук. ўстанова Даніі. Засн. ў 1742 у Капенгагене як Дацкае каралеўскае т-ва навук. Мае 2 секцыі: гісторыі і філасофіі; прыродазнаўчых навук і матэматыкі. Выдае «Meddelelser» («Паведамленні»), «Skriffer» («Працы»).

ДАЦКАЯ МОВА, адна з *германскіх моў*, дзярж. мова Даніі. На Д. м. гаворыць болей за 5 млн. чал. Вылучаюцца 2 групы дыялектаў: юцкія і дацкія астраўныя.

У гісторыі Д. м. адрозніваюць 2 перыяды: старажытнадацкі (да сярэдзіны 16 ст.) і новадацкі. Самыя даўнія (8 ст.) помнікі — рунічныя надпісы (гл. *Рунічныя алфавіты*), юрыд. рукапісы 8—14 ст. У выніку рэфармацыі ў 16—18 ст. Д. м. паступова выцесніла лацінскую, а потым нямецкую. Гал. асаблівасці новадацкай мовы: у фанетыцы — наяўнасць агубленых галосных пярэдняга раду, шматлікіх дыфтонгаў, значныя камбінаторныя змяненні зычных, накарэнны націск; у марфалогіі — вылучэнне 2 родаў (агульнага і сярэдняга, кожнаму адпавядае пэўная форма артыкля), 2 склонаў, складаная сістэма часоў і ладоў дзеяслова, нязменнасць яго па асобах. З 19 ст. Д. м. інтэнсіўна ўзбагачаецца за кошт нар. мовы. Друкарства з канца 15 ст. на аснове лац. графікі.

Літ.: Стеблин-Каменский М. И. История скандинавских языков, М.—Л., 1953; Вессен Э. Скандинавские языки, пер. со швед., М., 1949; Skautrup P. Det danske sprogs historie, Bd 1—3, København, 1944—53. *В. У. Мартынаў.* Мінск.

ДАЦКІ ВЕК (ЯРУС) (ад назвы Даніі), позні век (апошні, сёмы ярус) познемелавой эпохі (верхнемелавога аддзела) *мелавога перыяду (сістэмы)*. Вылучаны Э. Дэзорам у 1847. Геахраналагічнае становішча Д. в. дыскусійнае. У Д. в. на Усходне-Еўрапейскай платформе адбылася рэгрэсія мора, якая захапіла і тэр. Беларусі. Адклады дацкага яруса на тэр. рэспублікі не выяўлены.

ДАЦКІ ПРАЛІЎ, паміж а-вамі Грэнландыя і Ісландыя. Злучае Грэнландскае м. з Атлантычным ак. Даўж. каля 520 *км*, шыр. каля 260 *км*, глыб. 227—1600 *м*. Плывучыя льды ўвесь год. Выш. прыліваў 3,6—4 *м*.

ДАЦЫТ (ад лац. Dacia старажытнарымская назва Румыніі), кіслая эфузіўная горная парода. Хім. састаў адпавядае *гранадыярытам* і кварцавым дыярытам. Колер шэры, ружова-буры, чырвоны; структура пераважна парфіравая: у шклаватай або фельзітавай асноўнай масе змяшчаюцца парфіравыя ўкрапанікі плагіяклазаў, радзей кварцу, біятыту, рагавой падманкі, піраксену, санідзіну.

ДАЦЭНКА Іосіф Трафімавіч (1916, в. Шляхава Харкаўскага пав.— 28.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Канд. у чл. КПСС. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 26.9.1943 стралк. рота на чале з Д. фарсіравала Дняпро, вызваліла 4 нас. пункты; 28.9.1943 у час атакі знішчыла 2 варожыя ўзводы. Загінуў у баі.

ДАШКАВІЧЫ, вёска ў Ханявіцкім с/с Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Зальвянка. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 33 *км* на ПдУ ад Свіслачы, 123 *км* ад Гродна, 32 *км* ад чыг. ст. Ваўкавыск, на шашы г. п. Поразава — в. Падароск. 218 ж., гасп. 65 (1971). Цэх Свіслацкага камбіната буд. матэрыялаў. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Курган Славы на ўшанаванне памяці 43 землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДАШКАЎКА, вёска ў Магілёўскім р-не, каля Дняпра (0,5 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоная зорка». Чыг. ст. на лініі Магілёў — Жлобін. За 22 *км* на Пд ад Магілёва, на шашы Магілёў — Быхаў. 1807 ж., гасп. 633 (1971). *Магілёўская абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя*, філіял Гомельскага з-да буд. дэталяў, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. 2 сярэднія школы (з іх адна рабочай моладзі), муз. школа, кінатэатр, 2 бальніцы, аптэка, аддз. сувязі, 5 магазінаў. У жн. 1941 ням.-фаш. захопнікі загубілі 42 мірных жыхароў Д., а ў 1944 часткова спалілі вёску. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДАШКЕВІЧ Мікалай Паўлавіч [4(16).8.1852, в. Бяжоў Жытомірскага пав. Валынскай губ.— 20.1(2.2).1908], рускі і ўкраінскі гісторык і літаратуразнавец ліберальна-бурж. кірунку; прадстаўнік культурна-гістар. школы і параўнальна-гістар. метаду ў літаратуразнаўстве. Скончыў Кіеўскі ун-т (1873), пазней у ім праф. Акад. Пецярбургскай АН (з 1907). Даследаваў гісторыю Паўд. Русі і Вял. кн. Літ., у т. л. і Беларусі. Удакладніў храналогію некат. падзей, асветленых у Галіцка-Валынскім летапісе, выказаў у асн. правільную здагадку, што ўласна Літва знаходзілася на Пд ад р. Вілії. Аўтар прац пра рус. былінны эпас, творчасць рус., укр. пісьменнікаў.

Тв.: Княжение Даниила Галицкого по русским и иностранным известиям, Киев, 1873; Литовско-Русское государство, условия его возникновения и причины упадка, «Университетские известия», Киев, 1882, № 3, 5, 8—10, 1883, № 4; Борьба культур и народностей в Литовско-Русском государстве в период династической унии Литвы с Польшей, там жа, 1884, № 10, 12. *М. І. Ермаловіч.* Маладзечна.

ДАШКОЛЬНАЕ ВЫХАВАННЕ, выхаванне дзяцей у дзіцячых установах (у СССР ад 2 месяцаў да 7 гадоў), а таксама ў сям'і да паступлення іх у школу. Шырокая сетка дашкольных устаноў — *дзіцячых яслаў, дзіцячых яслаў-садоў, дзіцячых садоў* у Сав. Саюзе стварае ўмовы для выхавання дзяцей у калектыве і для ўдзелу жанчыны-маці ў грамадска карыснай працы. Выхаваўчая работа ў дашкольных дзіцячых установах вядзецца па праграме дашкольнага выхавання з улікам фіз. і псіхічных асаблівасцей дзяцей. Навукова абгрунтаваны рэжым, правільнае харчаванне і мед. нагляд, гульні, праца і заняткі забяспечваюць належнае фіз. і разумовае развіццё дзяцей, спрыяюць фарміраванню патрэбных маральных рысаў, набыццю першых навыкаў і элементаў эстэт. густу.

У 1802 англ. сацыяліст-утапіст Р. Оўэн стварыў у Нью-Ланарку першую дашкольную ўстанову — «Школу для маленькіх». Назву дзіцячы сад упершыню (1837) ужыў ням. педагог Ф. Фрэбель. У Расіі дашкольныя ўстановы арганізаваны ў 60-я г. 19 ст. У 1913 у Расіі было 19 дзіцячых яслаў; у 1914 існавала 150 дзіцячых садоў на 4000 дзяцей. На Беларусі да Кастр. рэв. было каля 20 дзіцячых садоў (пераважна прыватныя ўстановы для дзяцей службоўцаў і інтэлігенцыі).

Пасля Кастр. рэв. грамадскае Д. в. прызнана часткай сістэмы нар. асветы і стала дзярж. справай. 30.5.1918 У. І. Ленін падпісаў Дэкрэт, які прадугледжваў перадачу дашкольных устаноў у распараджэнне Наркамасветы. Значны ўклад у Д. в. зрабіла Н. К. Крупская, з яе ўдзелам праходзілі Усерасійскія з'езды (у 1919, 1921, 1924) і канферэнцыі па Д. в., распрацаваны «Статут дзіцячага сада», «Настаўленне для выхавальніка дзіцячага сада» (1938). У БССР кадры для дашкольных дзіцячых устаноў рыхтуюць Мінскі пед. ін-т імя М. Горкага, Магілёўскае дашкольна-пед. вучылішча, дашкольныя аддз. Мінскага, Пінскага, Гродзенскага і Полацкага пед. вучылішчаў. У 1970 у рэспубліцы было 2367 дашкольных устаноў усіх тыпаў (на 263,2 тыс. дзяцей). Гл. таксама *Дашкольная педагогіка, Сямейнае выхаванне.* Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Гл. пры арт. *Дашкольная педагогіка.*
Е. Г. Андрэева. Мінск.

ДАШКОЛЬНАЯ ПЕДАГОГІКА, навука пра выхаванне і навучанне дзяцей раняга і дашкольнага ўзросту. Апіраецца на асн. палажэнні агульнай *педагогікі* і *дзіцячай псіхалогіі*; цесна звязана з этыкай, эстэтыкай, агульнай і ўзроставай анатоміяй і фізіялогіяй, выкарыстоўвае дасягненні гігіены, медыцыны і інш. навук. Даследуе асаблівасці засваення дзецьмі дашкольнага ўзросту ведаў, выпрацоўкі ў іх уменняў і навыкаў станаўлення разумовых, маральных, валявых і інш. якасцей; на падставе гэтых даследаванняў вызначае шляхі выхавання і навучання.

Асновы Д. п. закладзены чэш. педагогам Я. А. *Каменскім*. Як асобная навука Д. п. выдзелілася з агульнай педагогікі ў пач. 2-й пал. 19 ст. Вялікая заслуга ў распрацоўцы пытанняў Д. п. належыць прагрэс. рус. педагогам 19 ст. К. Дз. Ушынскаму, П. Ф. Лесгафту, Л. М. Вадавозавай, Я. І. Канрадзі, А. С. Сімановіч і інш. Іх вучэнне пра адзінства фіз., разумовага і маральнага выхавання, пра індывідуальныя і ўзроставыя асаблівасці дзяцей, ролю працы, гульняў у фарміраванні дзіцячай асобы не страціла значэння і ў нашы дні.

Сав. Д. п. творча выкарыстала дасягненні прагрэс. заруб. і рус. Д. п. і з пазіцый марксісцка-ленінскага вучэння распрацавала новую сістэму выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту, паклаўшы ў аснову яе дыялектыка-матэрыялісц. паняцце дзіцяці як цэласнае асобы, апіраецца на дасягненні сумежных з ёю навук і практыку дашкольных дзіцячых устаноў. Яна ўзброіла выхавальнікаў перадавымі метадамі і прыёмамі выхавання. Гл. таксама *Дашкольнае выхаванне.*

Літ.: Коменский Я. А. Материнская школа, [пер. з лац.], М., 1947; Крупская Н. К. О дошкольном воспитании, М., 1967; Макаренко А. С. Лекции о воспитании детей, Соч., т. 4, М., 1957; Чувашев И. В. Очерки по истории дошкольного воспитания в России, М., 1955; Дошкольная педагогика, М., 1962; Люблинская А. А. Очерки психического развития ребенка, 2 изд., М., 1965.
Е. Г. Андрэева. Мінск.


ДАШЧАНКА (дашчанік), 1) нізенькая кадушка з тонкіх клёпак на муку, збожжа. Служыла і за *сявалку*. 2) Лодка з дошак.

ДВАДНЕНКА Іван Карпавіч [21.1(3.2).1903, Кіславодск — 15.12.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1943. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У вер. 1943 з батарэяй пераправіўся цераз Дняпро і адбіваў контратакі праціўніка. Памёр ад ран. Пахаваны ў Рэчыцы.

ДВАЙЧНАЯ СІСТЭМА ЗЛІЧЭННЯ, сістэма злічэння, пабудаваная на пазіцыйным (залежным ад месца) прынцыпе запісу лікаў, а асновай 2.

Мае толькі два знакі — лічбы 0 і 1. Лік 2 лічыцца адзінкай 2-га разраду і запісваецца ў выглядзе 10. Каб лік, запісаны ў дзесятковай сістэме злічэння, запісаць у дваічнай, яго дзеляць паслядоўна на 2 і запісваюць атрыманыя астачы 0 і 1 паслядоўна ад апошняга да першага. Напр., 37=18·2+1; 18=9·2+0; 9=4·2+1; 4=2·2+0; 2=1·2+0; 1=0·2+1. Т. ч., у Д. с. з. лік 37 запісваецца як 100101. На практыцы пры вылічэннях Д. с. з. нязручная, бо невялікія лікі запісваюцца як многазначныя. Карыстаюцца ёю ў тэарэт. пытаннях, а таксама пры вылічэнні на электронна-вылічальных машынах. Гл. таксама *Злічэнне.*

ДВАЙНІКІ (у геалогіі), заканамерныя зросткі аднародных крышталяў. Двайнікаванне часта паўтараецца некалькі разоў, утвараючы трайнікі, чацвернікі, а пры вялікай колькасці індывідаў — полісінт. Д. (гл. рыс.).



а *б* *в*

Двайнікі: *а* — двайнік гіпсу («ластаўчын хвост»); *б* — полісінтэтычны двайнік плагіяклазу; *в* — каленчаты трайнік рутылу.

ДВАЙНОГА АДМАЎЛЕННЯ ЗАКОН, закон логікі, паводле якога паўторанае двойчы адмаўленне дае сцвярджэнне.

У класічнай логіцы гэты закон запісваецца звычайна ў выглядзе формулы $\overline{\overline{A}} \to A$, дзе «—» — знак адмаўлення, «→» — знак імплікацыі. Гэта значыць, што калі даказана выказванне $\overline{\overline{A}}$, то (паводле правіла аддзялення) будзе даказана і выказванне A. Д. а. з. эквівалентны *выключанага трэцяга закону.*

Сапраўды: формула $\overline{\overline{A}} \to A$ раўназначная формуле $A \vee \overline{A}$, дзе «∨» — знак дыз'юнкцыі. Але калі ў сістэме правільна, што $\overline{\overline{A}} \to A$, то ў папярэдняй формуле двайное адмаўленне A можна замяніць на A. У выніку атрымаем $A \vee \overline{A}$. Паколькі ў сістэмах класічнай логікі дзейнічае і закон: калі ёсць A, то ёсць і яго двайное адмаўленне ($\overline{\overline{A}}$), то абагульненыя суадносіны сцвярджэння і двайнога адмаўлення можна выразіць эквіваленцыяй: $A \sim \overline{\overline{A}}$, дзе «~» — знак эквіваленцыі. У канструктыўнай логіцы закон выключанага трэцяга не мае месца. Таму і формула $\overline{\overline{A}} \to A$, эквівалентная гэтаму закону, таксама не мае месца. Формула ж $A \to \overline{\overline{A}}$ ў канструктыўнай логіцы — даказальная.

Літ.: Гл. пры арт. *Матэматычная логіка.*
Дз. П. Горскі. Масква.

ДВАЙНОЕ АПЛАДНЕННЕ, працэс апладнення ў *пакрытанасенных раслін*. Адкрыта ў 1898 рус. акад. С. Г. Навашыным. Заключаецца ў зліцці сперміяў не толькі з яйцаклеткай, але і з другасным ядром (цэнтральнай

клеткай) зародкавага мяшка. З аплодненай яйцаклеткі развіваецца зародак; з аплодненага другаснага ядра — своеасаблівы эмбрыянальны орган — *эндасперм*, які акумулюе запасныя пажыўныя рэчывы, неабходныя для жыўлення зародка пры прарастанні.

Д. а. мае вялікае біял. значэнне, у выніку яго зародак забяспечваецца пажыўнымі рэчывамі, якія маюць спадчынныя ўласцівасці бацькоўскай і мацярынскай расліны. Разам з інш. прыкметамі высокай арганізацыі Д. а. забяспечыла пакрытанасенным раслінам пашырэнне на зямлі і амаль неабмежаваныя магчымасці прыстасавання да ўмоў існавання (ад тропікаў да тундраў, ад пасычаных вадою мясцін да пустынь).

Літ.: Гл. пры арт. *Аплодненне.*

ДВАЙНЫ ДЭНАРЫЙ, сярэбраная, пазней білонная манета вартасцю 2 дэнарыі. Выпускаўся ў Вял. кн. Літ. у 1390, 1565—70, 1606—26. У 16 ст. Д. д. складаў 1/5 літоўскага і 1/4 польскага *гроша.*

Літ.: Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968.

ДВАНАЦЦАТАЯ УСЕРАСІЙСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РКП(б), адбылася 4—7.8.1922 у Маскве. Прысутнічала 129 дэлегатаў з рашаючым голасам і 92 з дарадчым.

Парадак дня: 1) Аб міжнар. становішчы (Р. Я. Сакольнікаў); 2) Аб прафес. саюзах (М. П. Томскі); 3) Парт. работа ў каапэрацыі (В. У. Куйбышаў); 4) Аб антысав. партыях і плынях (Р. Я. Зіноўеў); 5) Аб работах статутнай секцыі (В. М. Молатаў); 6) Аб паляпшэнні матэрыяльнага становішча членаў партыі (В. М. Молатаў); 7) Аб IV кангрэсе Камінтэрна (Р. Я. Зіноўеў).

Канферэнцыя ўхваліла знешнепаліт. лінію ЦК РКП(б) і адзначыла неабходнасць падтрымліваць на належным узроўні абараназдольнасць краіны. Яна паставіла задачу залучаць да актыўнай дзейнасці ў прафсаюзах шырокія слаі беспарт. рабочых, умацаваць прафсаюзныя органы дасведчанымі камуністамі, узмацніць ідэйнае кіраўніцтва прафсаюзамі. Вялікую ўвагу аддала развіццю каапэрацыі, асабліва сельскагаспадарчай. Канферэнцыя дала класавую ацэнку зменавехаўству як ідэалогіі новай нэпманаўскай буржуазіі і мабілізавала партыю і рабочы клас на рашучую барацьбу з варожымі Сав. уладзе партыямі і плынямі, якія намагаліся выкарыстаць нэп для рэстаўрацыі капіталізму. Канферэнцыя прыняла новы Статут партыі, які замацаваў павышаныя патрабаванні пры ўступленні ў РКП(б) выхадцаў з інш. партый і непралетарскіх слаёў насельніцтва. Канферэнцыя ўхваліла дзейнасць рас. дэлегацыі ў Выканкоме Камінтэрна і адзначыла, што ў дэлегацыі на кангрэс павінны быць прадстаўнікі нац. арг-цый РКП(б).

Літ.: Всероссийская конференция РКП(б). 4—7 авг. 1922. (Доклад и резолюции), М., 1922; КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954; Черников К. Двенадцатая конференция РКП(б), М., 1956.

У. Дз. Якутаў. Мінск.

ДВАНАЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б, адбыўся ў Мінску 5—14.2.1929. Прысутнічала 356 дэлегатаў з рашаючым і 222 з дарадчым голасам ад 41207 чл. і кандыдатаў у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздача ЦК КП(б)Б (Я. Б. Гамарнік); 2) Даклад Рэвізійнай камісіі КП(б)Б (Я. М. Кроль); 3) Справаздача ЦККК КП(б)Б (А. Я. Калнін); 4) Даклад аб пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. і культуры БССР 1928/29—1932/33 (М. М. Галадзед) і другая частка даклада аб гасп. буд-ве (М. М. Каркліс); 5) Аб рэгуляванні росту і чыстцы партыі (І. А. Васілевіч); 6) Аб рабоце прафсаюзаў (І. П. Рыжоў); 7) Выбары цэнтр. органаў.

З'езд ухваліў паліт. лінію, арганіз. і ідэйна-выхаваўчую работу ЦК КП(б)Б, якая адпавядала пастановам *Адзінаццатага з'езду КП(б)Б* і *Пятнаццатага з'езду ВКП(б).* Адзначыў, што КП(б)Б згуртавала свае рады ў барацьбе супраць трацкісцкай апазіцыі і правага ўхілу, выключыла трацкістаў з партыі і выкрыла трацкізм у вачах шырокіх мас працоўных, што ўзмацніла іх давер'е да партыі. З'езд даручыў новаму складу ЦК і ЦККК і надалей весці рашучую барацьбу з правым і левым ухіламі за адзінства партыі. Ён канстатаваў уздым нар. гасп. БССР: рост удзельнай вагі прамысловасці, уздым с. гасп., рост калектывізацыі і кааперавання сялянскіх гасп., умацаванне сацыяліст. элементаў у нар. гасп., павышэнне матэрыяльнага і культ. ўзроўню працоўных. Прыняў кантрольныя лічбы 1-га пяцігадовага плана развіцця нар. гасп. і культуры БССР, абмеркаваў пытанні рэканструкцыі нар. гасп. на новай тэхн. аснове, падрыхтоўкі кадраў кваліфікаваных спецыялістаў і рабочых, тэмпаў індустрыялізацыі. Прызнаў за неабходнае рэгуляваць склад партыі і намеціў да канца 1930 мець у КП(б)Б не менш як 50% рабочых, занятых на вытворчасці, у т. л. батракоў і с.-г. рабочых. Намеціў правесці з 1.3.1929 чыстку партыі.

З'езд выбраў ЦК КП(б)Б у складзе 77 чл. і 57 кандыдатаў, ЦККК — 76 чал., Цэнтр. рэвізійную камісію — 7 чал. На пленуме 16.2.1929 выбрана Бюро ЦК КП(б)Б у складзе 13 чл. і 7 кандыдатаў; сакратарамі ЦК КП(б)Б выбраны Я. Б. *Гамарнік* і І. А. *Васілевіч.*

Літ.: Стэнаграфічная справаздача XII з'езду КП(б)Б (5—14 лют. 1929 г.), Мн., 1929; Рэзалюцыі XII з'езду Камуністычнай партыі (б-коў) Беларусі (5—16 лют. 1929 г.), Мн., 1929; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 124—126.

В. С. Паваліхіна. Мінск.

ДВАНАЦЦАТЫ З'ЕЗД РКП(б), адбыўся 17—25.4.1923 у Маскве. 458 дэлегатаў з рашаючым голасам і 417 з дарадчым ад 386 тыс. чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздача ЦК РКП(б): а) Паліт. справаздача ЦК (Р. Я. Зіноўеў), б) Арганіз. справаздача ЦК (І. В. Сталін); 2) Справаздача Рэвіз. камісіі (В. П. Нагін); 3) Справаздача ЦККК (М. Ф. Шкіратаў); 4) Справаздача рас. прадстаўніцтва ў Выканкоме Камінтэрна (М. І. Бухарын); 5) Аб прамысловасці (Л. Д. Троцкі); 6) Нац. моманты ў парт. і дзярж. буд-ве (І. В. Сталін); 7) Падатковая палітыка ў вёсцы (Л. Б. Каменеў, М. І. Калінін, Р. Я. Сакольнікаў); 8) Аб раянаванні (А. І. Рыкаў); 9) Выбары цэнтр. органаў партыі. У секцыях з'езду абмяркоўваліся таксама пытанні: пра агітацыйна-прапагандысцкую работу, работу ў вёсцы, пра задачы РСІ і ЦККК і інш.

Асновай рашэнняў з'езду сталі ўказанні У. І. Леніна ў яго апошніх артыкулах і пісьмах (снеж. 1922—23). З'езд вызначыў канкрэтную праграму ажыццяўлення ленінскіх ідэй сацыяліст. буд-ва. Ён падкрэсліў значэнне цяжкай індустрыі як фундамента сацыялізма, прызнаў за неабходнае паскорыць развіццё кааперацыі на вёсцы, пацвердзіў, што асновай усіх гасп. намаганняў астаецца план электрыфікацыі Расіі. Ухваліў паліт. і арганіз. лінію ЦК, дзейнасць дэлегацыі

РКП(б) у Выканкоме Камінтэрна, падвёў вынікі 2 гадоў нэпа і вызначыў задачы далейшага аднаўлення нар. гаспадаркі. Вялікую ўвагу аддаў мерам па паляпшэнні работы прамысловасці, яе развіцці, павышэнні прадукцыйнасці працы, зніжэнні сабекошту прадукцыі, укараненні гасп. разліку. Адкінуў прапановы Троцкага развіваць прамысловасць за кошт эксплуатацыі і збяднення сялян, скарачаць цяжкую індустрыю пад выглядам яе стратнасці і нявыгаднасці; не згадзіўся з прапановамі Красіна, Радака і інш. зрабіць уступкі капіталіст. краінам, каб атрымаць крэдыты на развіццё прамысловасці. З'езд прыняў праграму нац.-дзярж. буд-ва ва ўмовах шматнацыянальнай дзяржавы. Ён падкрэсліў неабходнасць умацоўваць брацкія ўзаемаадносіны паміж рабочым класам б. пануючай нацыі і сялянствам раней прыгнечаных нацыянальнасцей, ліквідаваць эканам., паліт. і культ. адсталасць нацый, іх фактычную няроўнасць; прызнаў першачарговай барацьбу з перажыткамі вялікадзяржаўнага шавінізму, а таксама рашуча асудзіў ухілы да мясцовага нацыяналізму. З'езд прызнаў за патрэбнае даць абласцям неабходную самастойнасць у вырашэнні гасп. задач, поўнасцю ўлічваць інтарэсы і правы нац. рэспублік. З'езд стварыў аб'яднаны орган ЦКК — РСІ, задачы якога — ахоўваць адзінства партыі, умацоўваць парт. і дзярж. дысцыпліну, весці барацьбу з бюракратызмам, безгаспадарчасцю, злоўжываннямі.

З'езд выбраў цэнтр. органы партыі, значна пашырыў склад ЦК і ЦККК.

Літ.: Ленін У. І. Старонкі з дзённіка.— Аб кааперацыі.— Аб нашай рэвалюцыі.— Як нам рэарганізаваць Рабкрын.— Лепш менш, ды лепш, Тв., т. 33 (Полн. собр. соч., т. 45); Ярош. Пісьмо да з'езда.— Аб наданні заканадаўчых функцый Дзяржплану.— Да пытання аб нацыянальнасцях або аб «аўтанамізацыі», Тв., т. 36 (там жа); Двенадцатый съезд РКП(б). Стенографический отчет, М., 1968.

Т. Ю. Глінская. Мінск.

ДВАНАЦЦАТЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ (Надзвычайны), адбыўся ў Мінску 20—23.11.1936 і 15—19.2.1937. Прысутнічала 843 дэлегаты, з іх 556 камуністаў, 109 камсамольцаў, 178 беспартыйных.

Парадак дня: 1) Аб праекце Канстытуцыі СССР (А. Р. Чарвякоў); 2) Выбары дэлегатаў на VIII Усесаюзны Надзвычайны з'езд Саветаў; 3) Праект Канстытуцыі БССР (М. М. Галадзед).

З'езд адзначыў, што праект Канстытуцыі СССР усенародна абмеркаваны і ўхвалены на сходах, што па БССР у абмеркаванні прыняло ўдзел 2,5 млн. чал. Выступіла 70 тыс. чал., унесена каля 5 тыс. заўваг, дадаткаў і прапаноў, пераважна па практ. задачах сацыяліст. буд-ва. Абмеркаваўшы праект Канстытуцыі СССР, з'езд поўнасцю адобрыў яго. Для завяршэння Канстытуцыі СССР з'езд выбраў ад Беларусі 63 дэлегатаў на *Восьмы Усесаюзны з'езд Саветаў* (Надзвычайны) і ў сувязі з пачаткам (25 ліст.) яго работы перапыніў сваю работу. У адпаведнасці з новай Канстытуцыяй СССР Канстытуцыйная камісія пад старшынствам М. М. Галадзеда, створаная 26.6.1936, распрацавала і апублікавала 31.1.1937 праект Канстытуцыі БССР. У выніку ўсенароднага абмеркавання праекта Канстытуцыі БССР унесена 212 папраўак і дадаткаў. На другім пасяджэнні з'езд ухваліў і прыняў за аснову праект Канстытуцыі БССР. Для разгляду папраўак і дадаткаў і выпрацоўкі канчатковага тэксту Канстытуцыі БССР з'езд утварыў Рэдакцыйную камісію ў складзе 148 чал. 19.2.1937 з'езд зацвердзіў новую Канстытуцыю БССР і на яе падставе даручыў ЦВК БССР распрацаваць і зацвердзіць Палажэнне аб выбарах і назначыць дату выбараў у Вярх. Савет БССР.

Літ.: Бюлетэнь (Надзвычайнага XII з'езда Саветаў БССР), № 1—6, [Мн., 1936].

В. С. Паваліхіна. Мінск.

ДВАНАЦЦАТЫ УСЕРАСІЙСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ, адбыўся ў Маскве 7—16.5.1925. Прысутнічала 1084 дэлегаты з рашаючым голасам і 550 з дарадчым, 79,1% камуністы.

Парадак дня: даклады Нар. камісарыятаў земляробства (А. І. Свідэрскі), аховы здароўя (М. А. Сямашка) і фінансаў (М. А. Мілюціна); аб выдзяленні Туркестанскай АССР з складу РСФСР і аб стварэнні Туркменскай і Узбекскай саюзных рэспублік (А. С. Кісялёў); аб змене Канстытуцыі РСФСР (Дз. І. Курскі).

З'езд падвёў вынікі гасп., паліт. і культ.-выхаваўчай дзейнасці Саветаў Федэрацыі, прыняў рашэнне аб падзешаўленні с.-г. крэдыту, зніжэнні с.-г. падатку на 40%, землеўпарадкаванні, павелічэнні дзярж. асігнаванняў на с. гасп. і ахову здароўя, зацвердзіў новую Канстытуцыю РСФСР. На аснове ленінскай нац. палітыкі з'езд даў узбекскаму, туркменскаму, кіргізскаму, казахскаму і таджыкскаму народам права выйсці са складу Туркестанскай АССР і ўтварыць сав. сацыяліст. рэспублікі і вобласці па нац. адзнаках.

Літ.: XII Всероссийский съезд Советов. Стенографический отчет, М., 1925; Съезды Советов Союза ССР, союзных и автономных советских социалистических республик. Сб. документов, т. 4, ч. 1, М., 1962.

Л. М. Сямлявіцкі. Мінск.

ДВАНАЦЦАЦІ ТАБЛІЦ ЗАКОНЫ (Leges duadecum tabularum), старажытны помнік рымскага звычаёвага права. Запісаны каля сярэдзіны 5 ст. да н. э. на 12 дошках-табліцах. Замацоўвалі класавыя адносіны стараж. рымскага грамадства. Змяшчалі пераважна нормы грамадз., дзярж., крымін. права і працэсу.

ДВАНАЦЦАЦІПЁРСНАЯ КІШКА, пачатковы аддзел тонкай кішкі ад выхаднай адтуліны страўніка да парожняй кішкі. Даўж. яе ў чалавека 27—30 *см* (прыблізна 12 папярочнікаў пальца, адсюль назва). У поласць Д. к. адкрываюцца вывадныя пратокі падстраўнікавай залозы і печані. Залозістыя элементы сценкі выдзяляюць сакрэт, у якім ёсць ферменты, неабходныя для ператраўлення бялкоў, тлушчаў і вугляводаў (у поласці Д. к. ператраўленне рэчываў найб. інтэнсіўнае). Адзін з асн. відаў паталогіі Д. к.— язва (гл. *Язавая хвароба*).

Літ.: Гл. пры арт. *Анатомія.*

ДВАРАНСТВА, прывілеяванае саслоўе, частка пануючага класа ў эпоху феадалізму; у час капіталізму захоўвае пэўныя саслоўныя прывілеі, часткова зрошчваецца з буржуазіяй. Аснова эканам. і паліт. магутнасці Д.— феад. ўласнасць на зямлю. Д. карысталася юрыдычна замацаванымі прывілеямі: правам

валодаць зямлёю і прыгоннымі сялянамі, займаць найвышэйшыя адм. і вайск. пасады; вызвалялася ад падаткаў і г. д.

У Зах. Еўропе Д. як саслоўе свецкіх феадалаў адасобілася з часоў абсалютысцкіх манархій. Уключала колішнюю родавую знаць, найвышэйшых каралеўскіх чыноўнікаў, воінаў-васалаў і інш. Маёмаснае становішча Д., прывілеі, ступень адасобленасці ад інш. саслоўяў залежалі ад сац.-эканам. развіцця краіны: у Францыі Д. не займалася гандлем і прадукцыйнай працай, а існавала на ренту, служыла ў арміі ці пры двары; у Англіі, наадварот, займалася гандлем і прамысловасцю. З развіццём капіталіст. адносін пачынаецца разлажэнне ў сац. структуры Д. Кансерватыўныя вярхі Д., што трымаліся феад. спосабу эксплуатацыі, бяднелі. Больш прыстасаванае да новых умоў гаспадарання было дробнае і сярэдняе Д. (у Англіі джэнтры, у Францыі т. зв. «Д. Манты»). Д. Іспаніі, якое мела вялізныя сродкі ад рабунку калоній у Амерыцы, захавала ў 16—17 ст. пануючае становішча і перашкаджала развіццю капіталіст. адносін, што прывяло краіну да эканам. заняпаду. Д. Прусіі, якое ў 16—18 ст. вяло паншчынную гасп. прадпрыемніцкага тыпу, ператварылася ў *юнкерства*. Паліт. панаванне Д. ў краінах Зах. Еўропы ліквідавана ў выніку бурж. рэвалюцый 17—19 ст. Як арыстакр. праслойка Д. захавалася ў некат. капіталіст. краінах. Яно ўтрымала прывілеі: каставасць найвышэйшых пасад у арміі, дзярж. апараце, дыпламат. корпусе і г. д. Буйныя дваране-землеўладальнікі з'яўляюцца апорай рэакцыі і мілітарызму. У краінах Цэнтр. Еўропы землеўладанне і саслоўныя прывілеі Д. ліквідаваны ў выніку перамогі народна-дэмакр. ладу. На Русі з 12 ст. дваранамі называлі т. зв. «вольных слуг», якія атрымлівалі зямельныя надзелы на час вайск. службы ў князёў і найбольш багатых баяр. У працэсе аб'яднання рус. зямель у цэнтралізаваную дзяржаву Д. стала сац. і ваен. апорай вял. князя ў барацьбе з феад. міжусобіцамі. Судзебнік 1497 юрыдычна прызнаў Д. за новую катэгорыю пануючага класа феадалаў. Яно дамагалася паліт. правоў, запрыгонвання сялян (гл. *Саборнае ўлажэнне 1649*, *Прыгонныя права*), пашырэння землеўладання. Паводле перапісу 1678 дваране валодалі 85% прыгонных двароў. З 17 ст. радаслоўнае Д. запісвалася ў Дзярж. радаслоўец і *Аксамітную кнігу*. Адмена *месніцтва* і ўказ Пятра I пра адзінаспадчыннасць (1714) ліквідавалі розніцу паміж Д. і *баярамі* і злілі іх у адзін клас Д. У 18 ст. правы і прывілеі Д. расшыраны: у 1722 атрымалі прывілеі на дзярж. і вайск. службы, у 1762 манаполію на землеўладанне і вызвалены ад абавязковай дзярж. службы, у 1785 неабмежаваныя правы над прыгоннымі сялянамі (гл. *Даравальная грамата дваранству 1785*). У выніку *сялянскай рэформы 1861* Д. страціла неабмежаваныя правы над сялянамі і частку зямель, але захавала пануючае становішча ў кіраванні дзяржавай, у паліт. жыцці, свае вялізныя латыфундыі. У канцы 19 ст. ў Расіі 30 тыс. памешчыцкіх сем'яў (каля 150 тыс. чал.) мелі 70 млн. дзесяцін зямлі, а 10,5 млн. сялянскі гаспадарак (каля 50 млн. чал.) — 75 млн. дзесяцін. Д. было гал. апорай манархіі ў барацьбе з рэвалюц. рухам.

На Беларусі ў Д. пераведзена былая шляхта Вял. кн. Літ., якая пасля ўз'яднання Беларусі з Расіяй атрымала правы расійскага Д., захавала і расшырыла свае землеўладанні. У 70-я г. 18 ст. Кацярына II раздавала рус. дваранам вялізныя зямельныя надзелы на Беларусі з дзесяткамі тысяч прыгонных. У Магілёўскай губ. Завадоўскі атрымаў 25 860 прыгонных, Пацёмкін — 14 250, Зорыч — 11 800, Румянцаў — 11 100 і г. д. З развіццём капіталіст. адносін пачаўся эканам. заняпад часткі Д. Але і пасля адмены прыгону Д. на Беларусі захавала пануючае становішча. Дваранам належалі ўсе адм. пасады ў губернях; права кіраваць установамі па сялянскіх і вайск. справах, назначаць міравых суддзяў; дваранскія карпарацыйныя арг-цыі вырашалі найважнейшыя пытанні мясцовага жыцця. Па ўдзельнай вазе дваранскага землеўладання Беларусь стаяла на 2-м месцы ў Еўрап. Расіі пасля прыбалт. губерняў. У 1905 з 9 309 276 дзесяцін зямлі Д. належала 7 462 610 (80,2%). Землеўладальнікі, якія мелі больш як па 500 дзес. (2892 землеўладальнікі — 5,4% ад агульнай колькасці), валодалі 71 706 тыс. дзес. (77%). У гэтых магнатаў зямлі было больш, чым у 591 тыс. сялянскіх двароў. Паводле Усерасійскага с.-г. і пазямельнага перапісу 1917 Радзівілам у Мінскай губ. належала 265 678 дзесяцін, Ф. С. Агаркову 135 768, С. І. Чарнышовай-Безабразавай 91 тыс., І. І. Паскевіч 74 тыс.; больш як па 50 тыс. дзесяцін мелі Патоцкі, Пуслоўскі, Маркварт. Землеўладанне Д. скасавана Кастр. рэвалюцыяй (Дэкрэтам аб зямлі, прынятым II Усерас. з'ездам Саветаў), а само яно як саслоўе — дэкрэтам ЦВК і СНК ад 11(24).11. 1917 «Аб знішчэнні саслоўяў і грамадзянскіх чыноў».

Літ.: Ленін У. І. Аграрнае пытанне ў Расіі к канцу XIX в., Тв., т. 15 (Полн. собр. соч., т. 17); яго ж. Палітычныя партыі ў Расіі, Тв., т. 18 (там жа, т. 21); яго ж. Прыгонная гаспадарка ў вёсцы, Тв., т. 20 (там жа, т. 25); Яблочков М. История дворянского сословия в России, СПб., 1876; Романович-Славатинский А. Дворянство в России от начала XVIII в. до отмены крепостного права, 2 изд., Киев, 1912; Жукович П. Н. Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II, «Журнал Министерства народного просвещения», 1915, ч. 55, янв.— февр.; Кернажыцкі К. І. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII і першай палове XIX ст., Мн., 1935; Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии, М., 1965; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962; Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в., Мн., 1966; Гісторыя Беларускай ССР, т. 1, Мн., 1955.

Э. М. Савіцкі. Мінск.

ДВАРОВЫЯ ЛЮДЗІ, катэгорыя прыгоннага насельніцтва ў Расіі з канца 17 ст. да 1861.

Зямлі не мелі, жылі ў панскім двары (т. зв. дворня), працавалі ў маёнтку ці былі на паслугах у сям'і памешчыка. Паншчыны, аброку і інш. павіннасцей не выконвалі. Апошняе 10-годдзе напярэдадні рэформы 1861 іх выкарыстоўвалі і на с.-г. работах і на прамысл. прадпрыемствах у маёнтку; плацілі ім с.-г. прадуктамі. Былі пашраны продаж і абмен Д. л. У 1857 Д. л. ў Расіі складалі 6,8% ад колькасці прыгонных, на Беларусі — 3,4%. У час падрыхтоўкі адмены прыгоннага права колькасць Д. л. на Беларусі пабольшала за кошт пераводу ў дваровыя *цяглых сялян*. Паводле рэформы 1861 Д. л. атрымалі асабістую свабоду без зямельнага надзелу.

Літ.: Игнатович И. И. Помещичьи крестьяне накануне освобождения, 3 изд., Л., 1925; Чепко В. В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в., Мн., 1966.

В. В. Чапко. Мінск.

ДВАРЦЫ, вёска ў Рэчыцкім с/с Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Светлы шлях». За 15 *км* на У ад Камянца, 55 *км* ад Брэста, 26 *км* ад чыг. ст. Жабінка, на шашы, якая злучае вёску з Камянцом. 227 ж., двароў 64 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня.

ДВАРЧАНІН Ігнат Сымонавіч [27.5(8.6).1895, в. Погіры Слонімскага пав. Гродзенскай губ.— 8.12.1937], беларускі грамадскі дзеяч, літаратуразнавец. З бедных сялян. Скончыў філас. ф-т Пражскага ун-та (1925) са ступенню д-ра філасофіі. У 1912—15 настаўнічаў у в. Хмяльніца Слонімскага пав., у 1915—17 на вайск. службе. У 1917 у Мінску ўдзельнічаў у рабоце нацыяналістычнай арг-цыі *Беларуская вайсковая рада*. У 1918 сакратар культасветаддзела *Беларускага нацыянальнага камісарыята*, супрацоўнік газ. «Дзяніца». За арганізацыю ў 1919—20 бел. культурна-асветнага гуртка ў мяст. Дзятлава арыштаваны польскімі ўладамі і кінуты ў канцлагер у Беластоку. Друкавацца пачаў у 1917. Склаў «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 года)» (Вільня, 1927). Супрацоўнічаў у зах.-бел. друку нац.-вызв. кірунку, быў сакратаром *Беларускага выдавецкага таварыства* ў Вільні. У 1928 выбраны паслом у польскі сейм па спісе рабоча-сялянскага блока. Нам. старшыні рэвалюц.-вызв. арганізацыі *«Змаганне»*. Выкрываў антынародную знешнюю і ўнутраную палітыку бурж. Польшчы, абараняў сац. і нац. інтарэсы працоўных Зах. Беларусі. За рэвалюц. дзейнасць у 1930 засуджаны на 8 гадоў турмы. У выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР пераехаў (1932) у Мінск. Працаваў у АН БССР.

Літ.: Надпёманскія былі, Мн., 1968, с. 72—75.

А. М. Пяткевіч. Гродна.



ДВАРЧАНЫ, могільнік з трупапалажэннем каля в. Дварчаны Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл., ва ўрочышчы Карначыха на беразе Дварчанкі. У круглых, прадаўгаватых і прамавугольных магілах з каменнымі выкладкамі або каменна-земляными насыпамі на глыб. да 1,5 *м* знойдзены касцякі, што ляжаць галавою на З.

Даследаваўся В. Шукевічам (1885—95) і Э. А. Вольтэрам (1885—88). Пры раскопках у мужчынскіх і жаночых пахаваннях знойдзены прылады працы і упрыгожанні. Найб. ранняя пахаванні 13—14 ст.

Літ.: Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья, М.— Л., 1962; [Спицын А. А.] Предполагаемые древности Черной Руси, «Записки имп. Русского археологического об-ва», 1899, т. 11, в. 1 и 2; Szukiewicz W. Kurhany kamienne w pow. Lidzkim (gub. Wileńska), «Światowit», 1902, t. 4.

Я. Г. Звяруга. Мінск.

ДВАРЧАНЫ, вёска ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «За Радзіму». За 8 *км* на ПнЗ ад Паставаў, 256 *км* ад Віцебска, 9 *км* ад чыг. ст. Паставы, каля шашы Паставы — Нарач (1,5 *км*). 167 ж., двароў 57 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 13 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДВАРЫЁНАС (Dvarionas) Баліс Дамініка [н. 6(19).6.1904, Лібава], літоўскі савецкі кампазітар, піяніст і дырыжор. Нар. арт. СССР (1954). Скончыў Лейпцыгскую кансерваторыю (1924). Шмат канцэртаваў. З 1947 праф. Вільнюскай кансерваторыі. Аўтар оперы «Дафніс» (1956), балета «Сватанне» (1931), сімфоній (1947), канцэртаў для скрыпкі (1948, Дзярж. прэмія СССР 1949), фп. (1960, 1962), валторны (1963) з арк., уверцюр (1946, 1967), інстр. п'ес, хораў, рамансаў, музыкі да спектакляў і фільмаў (у т. л. «Савецкая Літва», Дзярж. прэмія СССР 1952), апрацовак літ. нар. песень. З І. Швядасам напісаў музыку Дзярж. гімна Літ. ССР (1956). Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі.

Літ.: Гаудримас Ю. Балис Дварионас, М., 1960.

ДВАРЫШЧА, 1) у Вял. кн. Літ. 13—16 ст., асабліва на Палессі — паселішча групы родзічаў, зямельны ўчастак, якім калектыўна валодала і дзе вяла гаспадарку вялікая сям'я.

З цягам часу вялікая сям'я распадалася на пасобныя сем'і, якія жылі сельскімі дварамі — «дымамі». Д. складалася з 3—5 «дымоў» і мела да 4 валок (каля 85 *га*) зямлі. *«Уставa на валокі»* 1557 садзейнічала распаду Д. і ўзніжэнню сялянскіх гаспадарак у складзе адной сям'і.

2) У Ст. Русі двор землеўладальніка — дом з гасп. пабудовамі. Д. называлі таксама сельскае паселішча, сяло, вёску. На Беларусі асталіся вёскі з назвамі Дворышча, Дварышча.

Літ.: Владимирский-Буданов М. Ф. Формы крестьянского землевладения в Литовско-Русском государстве XVI в., у кн.: Киевский сборник в помощь пострадавшим от неурожая, Киев, 1892; Материалы по истории земледелия СССР, сб. 1, М., 1952; Горцаў В. М. Аб эканамічным становішчы беларускага сялянства ў складзе Рэчы Паспалітай, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1958, № 3.

В. М. Горцаў. Мінск.

ДВАРЫШЧА, вёска ў Дрысвяцкім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на ўсх. беразе воз. Аболе. Цэнтр калгаса імя Фрунзе. За 26 *км* на ПдЗ ад Браслава, 256 *км* ад Віцебска, 32 *км* ад чыг. ст. Дукштас (Літ. ССР). 82 ж., гасп. 26 (1971). Млын, лесапільня. Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ДВАРЭЦ, вёска ў Яршэвіцкім с/с Валожынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоная гвардыя». За 30 *км* на У ад Валожына, 50 *км* ад Мінска, 15 *км* ад чыг. ст. Аляхновічы. 81 ж., гасп. 22 (1971). Клуб, фельч.-ак. пункт.

ДВАРЭЦ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Моўчадзь. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Заслонава. За 13 *км* на ПдУ ад Дзятлава, 160 *км* ад Гродна, 5 *км* ад чыг. ст. Наваельня, аўтобусная ст. на скрыжаванні дарог на Дзятлава і г. п. Казлоўшчыну. 609 ж., гасп. 222 (1971). Ільнозавод, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, антэка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік 23 аднавяскоўцам, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вял. Айч. вайну.

ДВАРЭЦ, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе р. Цна. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Жданава. За 15 *км* на ПнУ ад Лунінца, 252 *км* ад Брэста. 1619 ж., гасп. 370 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. 7.7.1944 нямец.-фаш. захопнікі загубілі 27 мірных жыхароў вёскі. Помнік 85 аднавяскоўцам — воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДВАРЭЦ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Дабасна. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дварэц». За 29 *км* на З ад Рагачова, 150 *км* ад Гомеля, 15 *км* ад чыг. ст. Чырвоны Бераг, на шашы Рагачоў — Бабруйск. 249 ж., гасп. 76 (1971). Камбінат. быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік на брацкай магіле 62 сав. воінаў і партызанаў, помнік землякам, якія загінулі ў Айч. вайну. Магіла Героя Сав. Саюза Ф. І. *Ульяніна.*

ДВАРЭЦ, вёска ў Цяпінскім с/с Чашніцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Палац працы». За 13 *км* на З ад Чашнікаў, 108 *км* ад Віцебска, 4 *км* ад чыг. ст. Заслонава, каля шашы Чашнікі — Лепель (3 *км*). 158 ж., двароў 57 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДВАЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б, адбыўся 20—23.9.1952 у Мінску. 709 дэлегатаў з рашаючым голасам і 145 з дарадчым ад 127 987 чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КП(б)Б (М. С. Патолічаў); 2) Справаздачны даклад Рэвіз. камісіі КП(б)Б (В. Я. Сядых); 3) Абмеркаванне праекта ЦК ВКП(б) «Дырэктывы XIX з'езду партыі па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1951—55 г.» (М. В. Зімянін); 4) Абмеркаванне праекта ЦК ВКП(б) «Тэкст зменена Статута партыі» (Ц. С. Гарбуноў); 5) Выбары ЦК КП(б)Б; 6) Выбары Рэвіз. камісіі КП(б)Б; 7) Выбары дэлегатаў на XIX з'езд ВКП(б).

З'езд адзначыў, што за справаздачны перыяд КП(б)Б умацавалася арганізацыйна (прынята 17 877 чл. і канд. у чл. партыі), загартавалася ідэйна, умацавала сувязі з масамі, павысіла ўзровень парт. і арганіз. работы. З'езд падвёў вынікі гасп. і культ. буд-ва ў БССР за 4-ю пяцігодку. Амаль усе галіны прамысловасці адноўлены на больш высокай тэхн. аснове; створаны і паспяхова развіваліся новыя галіны: вытворчасць трактараў, аўтамабіляў, веласіпедаў, лакамабіляў, дарожных і швейных машын і інш. У 1950 прамысловасць Беларусі выпусціла валавой прадукцыі на 15,1% больш, чым у 1940, выпрацоўка эл. энергіі вырасла ў 2,5 раза. Дасягнулі даваеннага ўзроўню па выпуску валавой прадукцыі лёгкая, харч., дрэваапр. прамысловасць, развіваўся чыг. і рачны транспарт. Вырас рабочы клас. Значныя поспехі дасягнуты ў развіцці с. гасп. Калгасы і саўгасы ў асн. асвоілі даваенныя пасяўныя плошчы, хутка аднаўлялася пагалоўе жывёлы, расла яе прадукцыйнасць. Амаль завершана калектывізацыя сялянскіх гасп. у зах. абласцях БССР; праведзена ўзбуйненне дробных калгасаў; узмацнілася мат.-тэхн. база МТС, калгасаў і саўгасаў, удвая павялічыўся трактарны парк. Павысіўся матэрыяльны і культ. ўзровень бел. народа. За 1947—50 зніжаліся 3 разы цэны на тавары масавага спажывання, адменена картачная сістэма. За пяцігодку ў гарадах і рабочых пас. адноўлена і пабудавана 4 млн. 247 тыс. м² жылля, на вёсцы здадзена 290,3 тыс. дамоў, сотні тысяч сем'яў перасяліліся з зямлянак. Павялічылася колькасць ВНУ, культ.-асветных устаноў. Выдатнай падзеяй у жыцці КП(б)Б і ўсіх працоўных рэсп. з'явілася заканчэнне выпуску на бел. мове 4-га выд. твораў У. І. Леніна. З'езд адзначаў і недахопы ў парт. кіраўніцтве развіццём нар. гаспадаркі. У рашэннях з'езду намечаны канкрэтныя меры ліквідацыі недахопаў у рабоце прамысловасці, с. гасп., у культ. буд-ве. Ён абавязаў парт. арг-цыі звярнуць увагу на паспяховае выкананне дырэктыў XIX з'езду КПСС па пяцігадовым плане, на далейшы ўздым усіх галін нар. гасп., рост матэрыяльнага дабрабыту і культ. ўзроўню бел. народа. З'езд ухваліў дзейнасць ЦК КП(б)Б, праект ЦК ВКП(б) «Дырэктывы XIX з'езду партыі па 5-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1951—1955 г.», прапанаваў парт. арг-цыям шырэй разгарнуць масава-паліт. работу, змагацца за выкананне заданняў пяцігодкі. Ён абмеркаваў і ўхваліў праект ЦК ВКП(б) «Тэкст зменена Статута партыі». У адпаведнасці з рашэннямі XIX з'езду КПСС аб зменах у Статуце і змене назвы партыі Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі [КП(б)Б] стала наз. Камуністычнай партыяй Беларусі (КПБ).

З'езд выбраў ЦК у складзе 127 чл. і 65 канд., Рэвіз. камісію ў складзе 34 чл.; дэлегатаў на XIX з'езд КПСС. На пленуме ЦК 24.9.1952 выбрана Бюро ЦК КП(б)Б: чл. П. А. Абрасімаў, М. І. Баскакаў, Ц. С. Гарбуноў, М. В. Зімянін, В. І. Казлоў, А. Я. Кляшчоў, К. Т. Мазураў, М. С. Патолічаў, С. К. Цімашэнка; канд. І. М. Макараў, П. М. Машэраў. Сакратарамі ЦК КП(б)Б выбраны М. С. Патолічаў, М. В. Зімянін, Ц. С. Гарбуноў.

Літ.: Патолічаў М. С. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі на XX з'ездзе КП(б)Б. Мн., 1952; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 454—458.

Ф. А. Зеляноўскі. Мінск.

ДВАЦЦАТЫ З'ЕЗД КПСС, адбыўся 14—25.2.1956 у Маскве. 1349 дэлегатаў з рашаючым голасам і 81 з дарадчым ад 6 795 896 чл. партыі і 419 609 канд. На з'ездзе прысутнічалі прадстаўнікі камуніст. і рабочых партый 55 краін свету.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КПСС (М. С. Хрушчоў); 2) Справаздачны даклад Цэнтр. рэвіз. камісіі (П. Р. Маскатаў); 3) Дырэктывы XX з'езду КПСС па 6-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1956—60 (М. А. Булганін); 4) Выбары цэнтр. органаў партыі. На закрытым пасяджэнні з'езд заслухаў даклад «Аб культе асобы і яго выніках» (М. С. Хрушчоў).

З'езд ухваліў паліт. лінію і практ. дзейнасць ЦК КПСС, прааналізаваў міжнар. і ўнутр. становішча СССР, вызначыў задачы па разгортванні камуніст. буд-ва ў краіне. Падкрэсліў, што гал. рысай сучаснай эпохі з'яўляецца выхад сацыялізма за рамкі адной краіны і ператварэнне яго ў сусв. сістэму. У матэрыялах з'езду развіты найважнейшыя тэарэт. пытанні сучаснасці: пра мірнае суіснаванне дзяржаў з розным сац. ладам, пра магчымасць недапушчэння сусв. вайны, пра формы пераходу розных краін да сацыялізма. Ленінскі прынцып мірнага суіснавання быў і застаецца ген. лініяй знешняй палітыкі СССР. З'езд адзначыў, што мірнае суіснаванне не азначае пропаведзі «класавага міру» і прымірэння камуніст. і бурж. ідэалогій, што яно

датычыць толькі адносін паміж дзяржавамі з розным сац. ладам і яго нельга пераносіць на адносіны паміж антаганіст. класамі бурж. грамадства, паміж метраполіямі і калоніямі. З'езд абгрунтаваў рэальную магчымасць недапушчэння сусв. вайны ў цяперашніх умовах, што абумоўлена зменай суадносін сіл на сусв. арэне на карысць міру і прагрэсу. Сусв. сістэма сацыялізма мае маральныя і матэрыяльныя сродкі папярэджання агрэсіі. Узмацніўся рэвалюц. рух рабочага класа ў капіталіст. краінах і нац.-вызв. рух прыгнечаных народаў, рух прыхільнікаў міру, які аб'ядноўвае людзей розных паліт., філас., рэліг. перакананняў; справу міру абараняе вял. група несацыяліст. дзяржаў, якія прытрымліваюцца палітыкі нейтралітэту, няўдзелу ў блоках, мірнага суіснавання. Разам з тым з'езд падкрэсліў, што мір не прыйдзе сам сабою. Неабходны згуртаванне і актыўныя дзеянні ўсіх міралюбных сіл, пільнасць да падкопаў імперыяліст. агрэсараў. Абагульняючы вопыт сусв. рабочага і камуніст. руху, з'езд зрабіў вывад, што ў абставінах новых суадносін сіл у свеце расшырыліся магчымасці перамогі сацыяліст. рэвалюцыі не толькі шляхам узбр. паўстання, але і мірнымі сродкамі. З'езд адзначыў, што мірны шлях развіцця рэвалюцыі магчымы толькі ў выніку ўмацавання адзінства рабочага класа, яго арганізаванасці, паліт. магутнасці і класавай свядомасці, трывалага саюзу з сялянствам і інш. слаямі працоўных. Гэты шлях магчымы толькі тады, калі рабочы клас будзе мець сілы, каб паралізаваць контррэвалюц. імкненні буржуазіі, захаваць або рэстаўрыраваць старыя парадкі. З'езд падкрэсліў, што пры ўсёй разнастайнасці формаў пераходу да сацыялізма абавязковай і рашаючай умовай з'яўляецца рэвалюц. заваёва пралетарыятам у саюзе з працоўным сялянствам паліт. улады, усталяванне дыктатуры рабочага класа, кіраўніцтва рабочага класа на чале з камуніст. партыяй сацыяліст. пераўтварэннямі грамадства. Адзначыўшы ўмацаванне ўнутр. становішча СССР, з'езд ахарактарызаваў яго як бесперапынны рост усіх галін грамадскай вытворчасці, далейшае ўмацаванне сав. грамадскага і дзярж. ладу, развіццё культуры, павышэнне дабрабыту народа. Крытычна прааналізаваўшы становішча ў прамысловасці і с. гасп., з'езд намеціў меры далейшага развіцця эканомікі краіны; прыняў Дырэктывы па 6-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1956—60. З'езд зацвердзіў прапановы ЦК КПСС па павышэнні жыццёвага ўзроўню працоўных і паляпшэнні ўмоў іх работы, пашырэнні правоў саюзных рэспублік, умацаванні сацыяліст. законнасці і строгім прытрымліванні гарантаваных Канстытуцыяй правоў грамадзян. З'езд патрабаваў ад парт. арг-цый зрабіць круты паварот да пытанняў канкрэтнага кіраўніцтва гасп. буд-вам, палепшыць падрыхтоўку і падбор парт. кадраў, наладзіць рэгулярную праверку выканання прынятых рашэнняў. З'езд унёс змены ў Статут партыі. Ён паставіў канкрэтныя задачы ў галіне ідэалаг. работы, патрабаваў павысіць яе пільнасць і баявітасць, берагчы чыстату марксісцка-ленінскай тэорыі, весці рашучую барацьбу супраць бурж. ідэалогіі, узмацніць наступленне на перажыткі капіталізму ў свядомасці людзей, павысіць узровень ідэйна-выхаваўчай работы сярод працоўных, ліквідаваць адрыў ідэалаг. работы ад жыцця, ад практыкі камуніст. буд-ва. З'езд асудзіў культ асобы і даручыў ЦК паслядоўна ажыццяўляць мерапрыемствы па забеспячэнні поўнага пераадолення культу, ліквідацыі яго шкодных вынікаў ва ўсіх галінах парт., дзярж. і ідэалаг. работы, строга прытрымлівацца нормаў парт. жыцця і прынцыпаў калектыўнасці кіраўніцтва, выпрацаваных У. І. Леніным. У адпаведнасці з рашэннямі з'езду 30.6.1956 ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў», у якой прааналізаваны прычыны, што нарадзілі гэтую з'яву, сурова асуджаны памылкі, дапушчаныя пад уздзеяннем культу асобы і намечаны меры іх выпраўлення. Асуджэнне культу асобы і далейшае пераадоленне яго шкодных вынікаў садзейнічалі далейшаму развіццю сацыяліст. дэмакратыі, павышэнню творчай актыўнасці камуністаў, усяго сав. народа ў палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці краіны.

З'езд выбраў ЦК у складзе 133 чл. і 122 канд. Цэнтр. рэвіз. камісію — 63 чал.

Літ.: XX съезд КПСС. 14—25 февр. 1956. Стенографический отчет, т. 1—2, М., 1956; Приветствия XX съезду Коммунистической партии Советского Союза от братских коммунистических и рабочих партий, М., 1956; КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК, ч. 4, М., 1960, с. 123—212.

А. У. Царук. Мінск.

ДВАЦЦАЦІПЯЦІТЫСЯЧНІКІ, перадавыя рабочыя, якія па закліку Камуніст. партыі добраахвотна паехалі на гасп.-арганіз. работу ў вёску ў перыяд калектывізацыі.

У ліст. 1929 Пленум ЦК ВКП(б) пастанавіў накіраваць на работу ў калгасы і МТС 25 тыс. рабочых з арганіз.-паліт. вопытам. Заявы з просьбай накіраваць у с. гасп. падалі больш за 70 тыс. рабочых. Адборачныя камісіі з удзелам прафсаюзаў і шырокай грамадскасці паслалі ў вёскі 27,5 тыс. чал., у т. л. 70% камуністаў і 9% камсамольцаў. У БССР на 200 месцаў рабочыя падалі 2600 заяў, паслана ў вёску 513 чал., з іх 71% камуністаў, 7,7% камсамольцаў, 327 чал. мелі прац. стаж больш за 10 гадоў. Сярод Д. рэспублікі 48 жанчын. З усіх накіраваных у вёску рабочых 402 выбраны старшынямі і чл. праўленняў калгасаў, 71 старшынямі і чл. праўленняў куставых аб'яднанняў, астатнія працавалі ў МТС, на парт. і сав. рабоце. Акрамя таго, у БССР прыехала 99 рабочых маш.-буд. з-да «Чырвонае Сормава».

Д. належыць вял. роля ў развіцці калг. руху, яны арганізоўвалі сацыяліст. спаборніцтва, вялі паліт.-выхаваўчую і культ.-масавую работу сярод сялян. Многія Д. асталіся працаваць у вёсцы стала і садзейнічалі далейшаму росту і ўмацаванню калгасаў.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967; Селунская В. М. Рабочие двадцатипятитысячники, М., 1964; Герман К. К. Ведущая роль рабочего класса в создании колхозного строя в Белоруссии, Мн., 1968.

Т. Ю. Глінскал. Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ДРУГІ З'ЕЗД КПБ, адбыўся 24—27.1.1956 у Мінску. 809 дэлегатаў з рашаючым голасам і 76 з дарадчым ад 132 414 чл. і 12 655 канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КПБ (М. С. Патолічаў); 2) Справаздачны даклад Рэвіз. камісіі (В. Я. Слдых); 3) Абмеркаванне праекта ЦК КПСС «Дырэктывы XX з'езду КПСС па 6-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1956—1960» (К. Т. Мазураў); 4) Выбары ЦК КПБ; 5) Выбары Рэвіз. камісіі КПБ; 6) Выбары дэлегатаў на XX з'езд КПСС.

З'езд адзначыў, што за справаздачны перыяд КПБ умацавала свае рады, павысіла ўзровень кіраўніцтва гасп. і культ. буд-вам. Прамысловасць БССР датэрмінова выканала 5-ы пяцігадовы план. Валавы выпуск прамысл. прадукцыі павялічыўся на 206%. Высокімі тэмпамі развіваліся машынабудаванне (валавая прадукцыя павялічылася ў 5,5 раза), энергетыка (выпрацоўка эл. энергіі выросла ў 2,4 раза), паліўная прамысловасць (здабыча торфу ў 1,9 раза), прамысловасць буд. м. (цэглы ў 2, шыферу ў 7 разоў). БССР выпускала 11,2% агульнасаюзнай вытворчасці трактараў, 3,9 аўтамабіляў, 8,3% металарэзных станкоў. Вытворчасць тавараў нар. ўжытку на душу насельніцтва павялічылася ўдвая. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці павысілася на 56%. Капіталаўкладанні ў нар. гасп. выраслі на 44%. Значныя поспехі дасягнуты ў развіцці с. гасп. Пасяўныя пл. павялічаны на 540 тыс. *га*, павысілася ўраджайнасць збожжавых і тэхн. культур, выраслі пагалоўе і прадукцыйнасць жывёлы. Вытворчасць мяса выросла на 41%, малака на 33%. Палепшыліся дабрабыт, сац. забеспячэнне, ахова здароўя працоўных. Значна выросла рэальная заработная плата рабочых, даходы сялян; вялося вялікае жыллёвае буд-ва. Разам з тым з'езд адзначыў, што ў прамысловасці, буд-ве, на транспарце слаба ўкараняліся дасягненні навукі і тэхнікі, вопыт перадавікоў, недастаткова выкарыстоўваліся ўнутр. рэзервы вытворчасці. У с. гасп. заставаліся нізкімі культура земляробства, ураджайнасць с.-г. культур і прадукцыйнасць жывёлы. Многія парт. і сав. органы, Міністэрства с. гасп. некваліфікавана кіравалі с. гасп., слаба займаліся эканомікай калгасаў і саўгасаў. З'езд ухваліў праект ЦК КПСС «Дырэктывы XX з'езду КПСС па 6-м пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1956—1960» і абавязаў ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР на аснове дырэктыў ЦК КПСС распрацаваць план развіцця нар. гасп. і культуры БССР на 1956—60. З'езд патрабаваў ад ЦК, абкомаў, гаркомаў, райкомаў партыі і пярвічных парт. арг-цый шырока прапагандаваць праект дырэктыў сярод працоўных рэспублікі, арганізаваць сацыяліст. спаборніцтва за выкананне і перавыкананне заданняў пяцігодкі; забяспечыць высокі ўзровень кіраўніцтва ўсімі галінамі нар. гасп. і культуры, узмацніць кантроль за выкананнем дырэктыў партыі і ўрада, узняць асабістую адказнасць кіраўнікоў за даручаны ўчастак работы, ролю прафсаюзаў, Саветаў і камсамола ў вырашэнні задач гасп. і культ. буд-ва.

З'езд выбраў ЦК КПБ у складзе 127 чл. і 76 канд., Рэвіз. камісію ў складзе 37 чл. На пленуме 27.1.1956 выбрана Бюро ЦК КПБ: чл. П. А. Абрасімаў, М. Я. Аўхімовіч, М. І. Баскакаў, Ц. С. Гарбуноў, В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў, І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў, І. М. Макараў, М. С. Патолічаў, С. К. Цімашэнка; канд. А. Н. Аксёнаў, Ф. А. Сурганаў. Сакратарамі ЦК выбраны М. С. Патолічаў, М. Я. Аўхімовіч, Ц. С. Гарбуноў, П. А. Абрасімаў, Ц. Я. Кісялёў. На XX з'езд КПСС выбрана 44 дэлегаты з рашаючым голасам і 3 з дарадчым.

Літ.: Патолічаў М. С. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXII з'езду КПБ, Мн., 1956; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 481—485. *Р. Дз. Маюшэнка.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ДРУГІ З'ЕЗД КПСС, адбыўся 17—31.10.1961 у Маскве. 4394 дэлегаты з рашаючым і 405 з дарадчым голасам ад 8 872 516 чл. партыі і 843 489 канд. На з'ездзе прысутнічалі дэлегацыі 80 зарубежных марксісцка-ленінскіх партый.

Парадак дня: 1) Справаздача ЦК КПСС (М. С. Хрушчоў); 2) Справаздачны даклад Цэнтр. рэвіз. камісіі (А. Ф. Горкін); 3) Праект Праграмы КПСС (М. С. Хрушчоў); 4) Аб зменах у Статуце КПСС (Ф. Р. Казлоў); 5) Выбары цэнтр. органаў партыі. З'езду папярэднічала абмеркаванне праектаў Праграмы і Статута КПСС, у якім удзельнічала каля 73 млн. чал., у т. л. больш за 9 млн. камуністаў.

З'езд падвёў вынікі развіцця краіны з часу XX з'езду КПСС, абмеркаваў карэнныя праблемы міжнар. становішча і развіцця сав. грамадства; ухваліў паліт. лінію і дзейнасць ЦК, прыняў новую *Праграму Камуністычнай партыі Савецкага Саюза* і Статут КПСС. Адзначыў, што гал. рысай міжнар. становішча з'яўляецца далейшы рост сіл сацыялізма, міру і дэмакратыі; аслабленне сусв. капіталізму. У спаборніцтве двюх сац. сістэм, якое складае асн. змест міжнар. развіцця, выяўляецца перавага сацыяліст. сістэмы. Сацыялізм вызначае гал. кірунак прагрэсу чалавечага грамадства. Доля краін сацыялізма ў сусв. прамысл. вытворчасці выросла з 27% у 1955 да 36% у 1960. СССР уступіў у перыяд разгорнутага буд-ва камунізма, большасць краін нар. дэмакратыі паспяхова будавала сацыялізм, шырылася супрацоўніцтва сацыяліст. краін. У той жа час слабелі эканам., паліт. і ідэалагічныя пазіцыі сусв. капіталізму. Гал. капіталіст. краінам характэрны няўстойлівасць тэмпаў эканам. развіцця, хранічнае беспрацоўе, мілітарызацыя. Узмацняліся супярэчнасці паміж імперыял. дзяржавамі, класавая барацьба, нац.-вызв. рух. Пасля XX з'езду КПСС 28 дзяржаў скінулі аковы каланіялізму. Новыя перамогі атрымаў міжнар. камуніст. рух: утварылася 12 новых партый, колькасць камуністаў выросла на 7 млн. З'езд прызнаў за неабходнае і надалей умацоўваць адзінства і абараназдольнасць краін сацыяліст. садружнасці, адзінства міжнар. камуніст. руху на пазіцыях марксізма-ленінізма, салідарнасць з рабочым класам і працоўнымі ўсяго свету, памагаць народам, якія змагаюцца за вызваленне ад калан. прыгнёту, паслядоўна ажыццяўляць прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам. З'езд падвёў вынікі ўнутрыпаліт. дзейнасці партыі па выкананні рашэнняў XX і XXI з'ездаў КПСС. Хуткімі тэмпамі развівалася прамысловасць. Вытворчасць прамысл. прадукцыі павялічылася на 80%, прадукцыйнасць працы выросла ў прамысловасці на 43, у буд-ве на 60%; уведзена ў строй каля 6 тыс. буйных прамысл. прадпрыемстваў. Палепшыўся дабрабыт народа. Нац. даход СССР вырас у 1960 у параўнанні з 1955 больш чым у 1,5 раза, рэальныя даходы рабочых і служачых у разліку на 1 працаўніка на 27%, даходы калгаснікаў на 33%, павышана заработная плата, скарочаны рабочы дзень і тыдзень, палепшана пенсійнае забеспячэнне. Былі дасягненні ў развіцці навукі, культуры. З'езд заклікаў накіраваць усе сілы партыі і народа на хутчэйшае выкананне сямігодкі, забяспечыць далейшае развіццё навук.-тэхн. прагрэсу, павышэнне прадукцыйнасці працы, паляпшаць планаванне і арг-цыю вытворчасці, павышаць жыццёвы ўзровень народа, развіваць навуку і культуру, умацоўваць абараназдольнасць краіны. З'езд прыняў новую (трэцюю ў гісторыі КПСС) Праграму партыі. Другая Праграма, прынятая VIII з'ездам РКП(б) у 1919, ажыццёўлена в перамогай сацыялізма. Трэцяя Праграма — праграма буд-ва камунізма. У ёй раскрыты заканамернасці сусв. рэвалюц. працэсу, дадзена характарыстыка камуніст. грамадства, вызначаны шляхі перарастання сацыялізма ў камунізм. Праграма складаецца з 2 частак. Першая — «Пераход ад капіталізму да камунізма — шлях развіцця чалавецтва» — дае ўсебаковы навук. аналіз сучаснай эпохі, асвятляе найважнейшыя пытанні тэорыі і практыкі грамадскага развіцця на міжнар. арэне. Другая — «Задачы КПСС па будаўніцтве камуніст. грамадства» — усебакова характарызуе камуніст. грамадства, паказвае, што для яго пабудовы неабходна вырашыць 3 асн. ўзаемазвязаныя задачы: стварыць мат.-тэхн. базу камунізма, пераўтварыць сацыяліст. грамадскія адносіны ў камуністычныя, выхаваць новага чалавека. З'езд зрабіў важны тэарэт. вывад пра тое, што ў выніку поўнай і канчатковай перамогі сацыялізма дзяржава дыктатуры пралетарыяту становіцца паліт. арг-цыяй усяго народа, пры кіруючай ролі рабочага класа (гл. *Агульнанародная дзяржава*), развіў далей вучэнне аб партыі, паказаў, што ў перыяд буд-ва камунізма яе кіруючая роля расце, што КПСС, астаючыся партыяй рабочага класа, адначасова стала партыяй усяго народа; замацаваў курс XX з'езду на далейшае развіццё ленінскіх нормаў парт. жыцця, вызначыў задачы арганіз. і ідэалагічнай работы.

З'езд выбраў ЦК у складзе 175 чл. і 155 канд., Цэнтр. рэвіз. камісію ў складзе 65 чл.

Літ.: XXII съезд Коммунистической партии Советского Союза. Стенографический отчет, ч. 1—3, М., 1962; Сікорскі У. Велічная праграма пабудовы камунізма, Мн., 1962; Сикорский В. М. XXII съезд КПСС. Новая Программа партии, М., 1968. *У. М. Сікорскі.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ПЁРШЫ З'ЕЗД КПБ, адбыўся 10—13.2.1954 у Мінску. 745 дэлегатаў з рашаючым голасам і 68 з дарадчым ад 118 895 чл. партыі і 10 690 канд.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КПБ (М. С. Патолічаў); 2) Справаздачны даклад Рэвіз. камісіі КПБ (В. Я. Слдых); 3) Выбары ЦК КПБ; 4) Выбары Рэвіз. камісіі КПБ.

З'езд адзначыў поспехі ў развіцці нар. гасп. БССР. Прамысловасць датэрмінова выканала план 3 гадоў пяцігодкі. Прырост валавой прадукцыі склаў 47,5% у параўнанні з 1950. Паспяхова развіваліся машына- і станкабудаванне, энергетыка, хім., лясная і дрэваапрацоўчая, лёгкая, харч. прамысловасць, чыг. транспарт; навука, л-ра і мастацтва, паляпшалася работа навуч. і культ.-асветных устаноў. Важнае месца ў рабоце з'езду занялі пытанні с. гасп. Адзначалася, што пасля вераснёўскага (1953) Пленума ЦК КПСС у вёску накіраваны механізатары, спецыялісты с. гасп., інж.-тэхн. работнікі, з іх больш за 4 тыс. камуністаў. Умацаваны кіруючыя кадры с. гасп., пярвічныя парт. арг-цыі. На 1.1. 1954 у калгасах, саўгасах і МТС працавала 26 348 камуністаў — 20,3% агульнага складу КПБ. З'езд абавязаў парт. органы накіраваць усе сілы на датэрміновае выкананне плана 5-й пяцігодкі, ажыццявіць рашэнні вераснёўскага (1953) Пленума ЦК КПСС па пытаннях с. гасп., звярнуўшы асаблівую ўвагу на расшырэнне пасяўных плошчаў, павышэнне ўраджайнасці і развіццё жывёлагадоўлі. З'езд патрабаваў ад ЦК, абкомаў, гаркомаў і райкомаў КПБ палепшыць унутрыпарт. работу, удасканальваць стыль і метады дзейнасці парт. органаў, павысіць узровень паліт. і арганіз. работы ў масах.

З'езд выбраў ЦК у складзе 125 чл. і 75 канд., Рэвіз. камісію КПБ у складзе 35 чл. На пленуме 13.2.1954 выбрана Бюро ЦК КПБ: чл. П. А. Абрасімаў, М. Я. Аўхімовіч, М. І. Баскакаў, Ц. С. Гарбуноў, І. Ф. Клімаў, В. І. Казлоў, К. Т. Мазураў, М. С. Патолічаў, С. К. Цімашэнка; канд. Л. І. Лубенніка, І. М. Макараў, П. М. Машэраў. Сакратарамі ЦК КПБ выбраны М. С. Патолічаў, М. Я. Аўхімовіч, Ц. С. Гарбуноў.

Літ.: Патолічаў М. С. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXI з'езду КПБ, Мн., 1954; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 468—470. *Ф. А. Зелянюўскі.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ПЁРШЫ З'ЕЗД КПСС (нечарговы), адбыўся 27.1—5.2.1959 у Маскве. 1261 дэлегат з рашаючым голасам і 106 з дарадчым ад 7 622 356 чл. партыі і 616 775 канд. На з'ездзе прысутнічалі дэлегацыі ад 72 марксісцка-ленінскіх партый замежных краін. Абмяркоўваў кантрольныя лічбы развіцця нар. гасп. СССР на 1959—65. З'езду папярэднічала ўсенар. абмеркаванне тэзісаў аб кантрольных лічбах развіцця нар. гасп. СССР на 1959—65.

Магутнае эканам. развіццё, высокая ступень абараназдольнасці краіны, рост сусв. сістэмы сацыялізма дазволілі з'езду зрабіць важны тэарэт. і практ. вывад, што сацыялізм у СССР перамог поўнасцю і канчаткова, што Сав. краіна ўступіла ў перыяд разгорнутага буд-ва камуніст. грамадства. Найважнейшыя задачы гэтага перыяду: стварэнне мат.-тэхн. базы камунізма; развіццё і ўдасканаленне сацыяліст. грамадскіх адносін; выхаванне новага чалавека. З'езд развіў і пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі: пра дзве фазы камуніст. грамадства і заканамернасці пераходу ад сацыялізма да камунізма; пра стварэнне мат.-тэхн. базы камуніст. грамадства; пра размеркаванне ва ўмовах сацыялізма і камунізма матэрыяльных і духоўных даброт; пра паліт. арг-цыю грамадства, дзярж. лад і кіра-

ванне ў перыяд разгорнутага буд-ва камуніст. грамадства; пра развіццё сусв. сацыялізм. сістэмы і інш. З'езд зацвердзіў кантрольныя лічбы развіцця нар. гасп. СССР на 1959—65 і вызначыў гал. задачы 7-гадовага плана: далейшы ўздым усіх галін эканомікі на базе пераважнага росту цяжкай індустрыі, узмацненне эканам. патэнцыялу краіны з тым, каб забяспечыць бесперапыннае павышэнне жыццёвага ўзроўню народа. У галіне прамысловасці намячалася павялічыць аб'ём валавой прадукцыі на 80%. Паскораныя тэмпы развіцця планаваліся па машынабудаўнічай і хім. прамысловасці. Асаблівая ўвага аддавалася тэхн. пераўзбраенню нар. гаспадаркі. Намячалася значна павялічыць вытворчасць тавараў нар. ўжытку, рост нац. даходу на 62—65%. Прадугледжваўся ўздым гаспадаркі саюзных рэспублік. У БССР планавалася стварыць нафтаперапр. і хім. прамысловасць, далей развіваць машынабудаўнічую, лёгкую і харч. прамысловасць, с. гасп., умацаваць паліўна-энерг. базу. Капітальныя ўкладанні для БССР вызначаны ў 32 млрд. руб. З'езд намеціў гал. задачы партыі ў галінах эканам., паліт. і ідэалаг. работы, у міжнар. адносінах. Прыняў пастанову склікаць чарговы XXII з'езд КПСС у 1961.

Літ.: Внеочередной XXI съезд Коммунистической партии Советского Союза. Стенографический отчет, ч. 1—2, М., 1959. *У. К. Коршук.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ПЯТЫ З'ЕЗД КПБ, адбыўся 26—28.9.1961 у Мінску. 675 дэлегатаў з рашаючым голасам і 97 з дарадчым ад 214 399 чл. партыі і 25 954 канд.

Парадак дня: 1) Аб праекце Праграмы КПСС (Ф. А. Сурганаў); 2) Аб праекце Статута КПСС (П. М. Машэраў); 3) Справаздачны даклад ЦК КПБ (К. Т. Мазураў); 4) Справаздача Рэвіз. камісіі (В. Я. Сядых).

З'езд ухваліў распрацаваныя ЦК КПСС праекты Праграмы і Статута КПСС і даручыў ЦК КПБ вывучыць прапановы, якія паступілі ад працоўных Беларусі ў выніку абмеркавання гэтых дакументаў. Ён абавязаў абкомы, гаркомы і райкомы КПБ забяспечыць глыбокае вывучэнне праектаў Праграмы і Статута сярод рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі. З'езд адзначыў, што за перыяд пасля XXIV з'езду КПБ выраслa ідэйна і ўмацавалася арганізацыйна, павялічылася на 36 906 чал. Дасягнуты новыя поспехі ў развіцці нар. гасп. За 1959—61 у эканоміку рэспублікі ўкладзена 1,5 млрд. руб. Аб'ём прамысл. вытворчасці ў 1961 павялічыўся ў параўнанні з 1958 на 40% пры плане 26,9, прадукцыя машынабудавання на 85%, выпрацоўка эл. энергіі, аб'ём вытворчасці хім. прамысловасці — у 1,5, радыёэлектроннай, станкабудаўнічай і інструментальнай — у 2, электратэхн. і прыладабудаўнічай прамысловасці — у 3 разы. Валавая прадукцыя с. гасп. выраслa на 30%, павялічыліся пасяўныя плошчы, вытворчасць мяса і малака. Палепшыўся дабрабыт працоўных: павышана заработная плата нізкааплатным рабочым і служачым, завершаны пераход рабочых і служачых на 6—7-гадзінны рабочы дзень, пачалася адмена падаткаў, на вёсцы адменены абавязковыя пастаўкі дзяржаве прадуктаў з асабістай гаспадаркі. Вялося вялікае жыллёвае буд-ва. З'езд ухваліў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК КПБ.

Адзначыўшы недахопы ў прамысловасці, капітальным буд-ве, у с. гасп., з'езд вызначыў задачы КПБ па выкананні сямігодкі, абавязаў парт., сав. і гасп. органы павысіць узровень кіраўніцтва нар. гасп., патрабаваў ад парт. арг-цый палепшыць арганіз. і ідэалаг. работу.

З'езд выбраў ЦК КПБ у складзе 125 чл. і 57 канд., Рэвіз. камісію — 35 чл. Пленум ЦК 28.9.1961 выбраў Бюро ЦК: чл. А. І. Золаў, В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў, І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў, І. М. Макараў, П. М. Машэраў, С. В. Прытыцкі, Ф. А. Сурганаў, Дз. Ф. Філімонаў, В. Ф. Шаура; канд. Л. Г. Максімаў, В. А. Пянькоўскі, С. А. Платовіч. Сакратарамі ЦК КПБ выбраны К. Т. Мазураў, П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, Дз. Ф. Філімонаў, В. Ф. Шаура.

Літ.: Мазураў К. Т. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXV з'езду, Мн., 1961; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 524—528. *Ф. П. Шмыгаў.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ СЁМЫ З'ЕЗД КПБ, адбыўся ў Мінску 22—24.2.1971. 753 дэлегаты з рашаючым і 41 з дарадчым голасам ад 434 527 чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КПБ (П. М. Машэраў); 2) Справаздачны даклад Рэвіз. камісіі КПБ (І. С. Канановіч); 3) Аб праекце Дырэктыў XXIV з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75 (Ц. Я. Кісялёў); 4) Выбары ЦК КПБ; 5) Выбары Рэвіз. камісіі КПБ.

З'езд ухваліў дзейнасць ЦК КПБ па выкананні рашэнняў XXIII з'езду КПСС, XXVI з'езду КПБ, 8-га пяцігадовага плана, адзначыў вял. поспехі ў развіцці эканомікі рэспублікі, павышэнні дабрабыту і культуры працоўных. Пяцігодка па асн. паказчыках выканана датэрмінова. Аб'ём прамысл. прадукцыі вырас у 1,8 раза супраць запланаваных 1,7 раза. Пабудавана больш за 60 прамысл. прадпрыемстваў. Вытворчасць прылад і сродкаў аўтаматызацыі павялічылася ў 3,7, эл. энергіі ў 1,8, прадуктаў хіміі і нафтахіміі ў 3,3 раза, машынабудаванне вырасла ўдвая. У 1970 БССР дала 49% агульнасаюзнай вытворчасці калійных угнаенняў, 19 поліэтылену, 10 хім. валокнаў, 18 трактараў, 13 металарэзных станкоў і аўтам. ліній, 22% матацыклаў. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці за пяцігодку павялічылася на 39%, сяроднегадавыя тэмпы прыросту нац. даходу склалі 14%, прыбытак вырас у 2,6 раза. На аснове рашэнняў XXIII з'езду, пастаноў сакавіцкага (1965) і наступных пленумаў ЦК КПСС ажыццёўлена праграма арганіз., эканам. і сацыяльных мер па інтэнсіфікацыі с. гасп. За пяцігодку ў с. гасп. ўкладзена 1,4 млрд. руб. дзярж. сродкаў — на 662 млн. больш, чым за папярэднюю. Валавая прадукцыя ў калгасах і дзяржгасах выраслa на 45%, прадукцыйнасць працы на 50%, чысты даход калгасаў і прыбытак саўгасаў у 5 разоў. Зборы збожжа павялічыліся на 53%, бульбы на 43, вытворчасць мяса на 73, малака на 66%, яец у 2,4 раза. Датэрмінова выкананы пяцігадовы план нарыхтовак асн. відаў с.-г. прадукцыі. Вырас дабрабыт працоўных: нац. даход павялічыўся больш чым у 1,5 раза, рэальныя даходы на душу насельніцтва на 37%, сяреднемесячная зарплата рабочых і служачых на 31,6%, грашовыя і натуральныя даходы калгаснікаў ад грамадскай гасп. ў 1,6 раза; уведзена пенсійнае забеспячэнне, сац. страхаванне і гарантаваная грашовая аплата працы калгаснікаў, пяцідзённы рабочы тыдзень з 2 выхаднымі днямі для рабочых і служачых. Працоўныя атрымалі 20 млн. $м^2$ жылля, расшырылася сетка школ, культ.-асветных, мед., спарт. і дашкольных устаноў. Рознічны тавараабарот дзярж. і каап. гандлю вырас на 69%. З'езд падкрэсліў павелічэнне ролі навукі ў вырашэнні карэнных нар.-гасп. і сацыяльных праблем. Ухваліў праект Дырэктыў XXIV з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75 і даручыў ЦК КПБ і Савету Міністраў БССР на яго аснове распрацаваць пяцігадовы план развіцця нар. гасп. рэспублікі. За пяцігодку аб'ём прамысл. прадукцыі плануецца павялічыць на 50—53% пры паскораным развіцці энергетыкі, машынабудавання, прыладабудавання, хіміі і нафтахіміі, электронікі і радыётэхнікі; праводзіць далейшую канцэнтрацыю і спецыялізацыю вытворчасці. Прадукцыйнасць працы павысіць у прамысловасці на 38%, у с. гасп. на 50%. На аснове інтэнсіфікацыі с. гасп. намечана павялічыць вытворчасць прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі; давесці валавы збор збожжа да 7 млн. *т* і штогод прадаваць дзяржаве 500 тыс. *т* па асн. плане і не менш чым 35% звыш плана; у калгасах і саўгасах на 100 *га* с.-г. угоддзяў атрымаць не менш чым 100 *ц* мяса і 500 *ц* малака. Прадаць у 1975 дзяржаве мяса 1015 тыс. *т*, малака 3630 тыс. *т*, яец 790 млн. шт., бульбы 1630 тыс. *т*, агародніны 350 тыс. *т*, цукр. буракоў 1 млн. *т*, ільновалакна 140 тыс. *т*. З'езд паставіў задачу і надалей павышаць ролю навукі і тэхнікі як найважнейшых фактараў росту эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, развіваць творчую ініцыятыву спецыялістаў нар. гасп., рацыяналізатараў і вынаходнікаў; завяршыць пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі; няўхільна паляпшаць дабрабыт працоўных.

За справаздачны перыяд КПБ загартавалася ідэйна, умацавалася арганізацыйна, узбагацілася новым вопытам паліт. кіраўніцтва, яшчэ цясней згуртавалася вакол ЦК КПСС. Палепшыліся падбор і расстаноўка кадраў, каля 75% чл. і канд. у чл. партыі працуюць у сферы матэрыяльнай вытворчасці. У партыю прынята 91 484 чал., з іх 48,8% рабочыя, 20,9% калгаснікі, больш за 40% прыйшлі ў партыю з камсамола. Узмацнілася актыўнасць пярвічных парт. арг-цый у выкананні нар.-гасп. планаў. Павысіўся ўзровень парт. кіраўніцтва Саветамі, прафсаюзамі, камсамолам і інш. грамадскімі арг-цыямі. З'езд адзначыў поспехі ў ідэалаг. рабоце КПБ, накіраванай на развіццё паліт. свядомасці і фарміраванне навук. светапогляду працоўных, выхаванне іх у духу сав. патрыятызму і пралет. інтэрнацыяналізму, непрымірымасці да бурж. ідэалогіі. Вырашальную ролю ў гэтым адыграла падрыхтоўка да святкавання 50-годдзя Вял. Кастр. сацыялісг. рэвалюцыі і 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. З'езд абавязаў ЦК, абкомы, гаркомы і райкомы КПБ, пярвічныя парт. арг-цыі паглыбляць работу па камуніст. выхаванні працоўных, дамагацца арганічнай сувязі ідэалаг. работы з практыкай камуніст. буд-ва, павысіць узровень марксісцка-ленінскай адукацыі камуністаў і беспартыйных, арганіз.-парт. работы, ролю камуністаў у выкананні нар.-гасп. планаў, паляпшаць работу з кадрамі, кіраўніцтва Саветамі, прафсаюзамі, камсамолам і інш. грамадскімі арг-цыямі, шырока разгарнуць сацыялісг. спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў 9-й пяцігодкі.

З'езд выбраў ЦК КПБ у складзе 135 чл. і 63 канд. у чл. ЦК, Рэвіз. камісію КПБ у складзе 41 чл. На пленуме, які адбыўся 24.2.1971, выбрана Бюро ЦК КПБ: чл. Ц. Я. Кісялёў, Л. Г. Кляцкоў, А. Т. Кузьмін, У. Е. Лабанок, П. М. Машэраў, У. Ф. Міцкевіч, І. Я. Палякоў, М. Н. Полазаў, С. В. Прытыцкі, А. А. Смірноў, Ф. А. Сурганаў; канд. І. М. Трацяк, У. І. Падрэз. Першым сакратаром ЦК КПБ выбраны П. М. Машэраў, другім Ф. А. Сурганаў, сакратарамі ЦК КПБ — А. Т. Кузьмін, У. Ф. Міцкевіч, А. А. Смірноў.

Літ.: Матэрыялы XXVII з'езду Камуністычнай партыі Беларусі, Мн., 1971. *М. Я. Шкляр.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ТРЭЦІ З'ЕЗД КПБ (нечарговы), адбыўся 14—15.1.1959 у Мінску. 645 дэлегатаў з рашаючым голасам і 83 з дарадчым ад 168 716 чл. і 19 193 канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Кантрольныя лічбы развіцця нар. гасп. СССР на 1959—65 і задачы кампартыі Беларусі (К. Т. Мазураў).

З'езд адзначыў, што за 1956—58 у рэспубліцы аб'ём прамысл. вытворчасці павялічыўся на 41%. Шырокі размах набыло капітальнае і жыллёвае буд-ва. Валавая прадукцыя с. гасп. за 1953—58 выраслa ў 2,2, у т. л. жывёлагадоўлі ў 3,1, грашовыя даходы калгасаў — амаль у 4, аплата працы калгаснікаў у 2,2 раза. З'езд зацвердзіў кантрольныя лічбы развіцця нар. гасп. БССР на 1959—65. Планавалася аб'ём прамысл. вытворчасці павялічыць у 1,8 раза; стварыць новыя галіны прамысловасці: нафтаперапрацоўчую і вытв. мінеральных угнаенняў; забяспечыць далейшае развіццё энергетыкі, машынабудавання, хім., лёгкай, харч. прамысловасці. Падняць зах. вобласці БССР па развіцці прамысловасці да ўзроўню ўсходніх. Капіталаўкладанні ў нар. гасп. намячаліся ў суме 32 млрд. руб.— амаль столькі, колькі за ўвесь час існавання БССР. У с. гасп. да 1965 планавалася павялічыць вытворчасць збожжа ў 1,7—2 разы, ільновалакна і бульбы ў 1,5, мяса і малака ў 2,1 раза. Гал. задача земляробства — павысіць ураджайнасць усіх с.-г. культур. Пабудаваць жылля 15 млн. $м^2$, паляпшаць ахову здароўя, развіваць нар. асвету і навуку. З'езд абавязаў парт., сав. і гасп. органы павысіць узровень кіраўніцтва нар. гасп. рэспублікі, арганізаваць шырокае сацыялісг. спаборніцтва за датэрміновае выкананне сямігодкі.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 501—502.
М. В. Уласенка. Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ТРЭЦІ З'ЕЗД КПСС, адбыўся 29.3—8.4.1966 у Маскве. 4619 дэлегатаў з рашаючым голасам і 323 з дарадчым ад 12 471 079 чл. і канд. у чл. партыі. У рабоце з'езду ўдзельнічалі таксама прадстаўнікі 86 камуніст., рабочых, нац.-дэмакр. і левых сацыяліст. партый свету.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КПСС (Л. І. Брэжнеў); 2) Справаздачны даклад Цэнтр. рэвіз. камісіі КПСС (Н. А. Мураўёва); 3) Дырэктывы XXIII з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1966—70 (А. М. Касыгін); 4) Выбары цэнтр. органаў партыі.

З'езд адзначыў, што ў сучасную эпоху гал. кірунак гістар. развіцця вызначае сусв. сацыяліст. сістэма, сілы, якія змагаюцца супраць імперыялізму, за сацыяліст. перабудову грамадства. Сусветны камуніст. рух стаў самай уплывовай паліт. сілай сучаснасці; на новую ступень узнялося эканам. супрацоўніцтва краін сацыялізма; многія народы, якія заваявалі дзярж. самастойнасць, усё больш цвёрда становяцца на шлях некапіталіст. развіцця. З'езд ухваліў паліт. лінію і практ. дзейнасць ЦК КПСС. Знешнепаліт. дзейнасць КПСС і Сав. дзяржавы разам з інш. сацыяліст. краінамі накіравана на забеспячэнне спрыяльных умоў для пабудовы сацыялізма і камунізма, умацаванне адзінства і згуртаванасці сацыяліст. краін, урэгуляванне рознагалоссяў у міжнар. камуніст. руху на аснове марксізма-ленінізма, падтрыманне нац.-вызв. руху, адстойванне прынцыпу мірнага суіснавання дзяржаў з розным сац. ладам, на рашучы адпор агрэс. сілам імперыялізму і збаўленне чалавецтва ад новай сусв. вайны. Унутры краіны ўвага партыі накіравана на вырашэнне гал. эканам. задачы — стварэнне мат.-тэхн. базы камунізма. У выніку выканання плана сямігодкі значна павялічыліся аб'ём прамысл. прадукцыі, вытворчасць тавараў нар. ўжытку і культ.-бытавога прызначэння, тэхнічна перабудаваны найважнейшыя галіны нар. гасп. Асн. вытв. фонды выраслі ў 1,9 раза, нац. даход на 53%, аб'ём прамысл. вытворчасці на 84 (па Беларусі ў 2,1 раза) замест запланаваных 80%. Аб'ём валавой прадукцыі с. гасп. ў 1965 перасягнуў самы высокі ўзровень папярэдніх гадоў. Павысіўся матэрыяльны і культ. ўзровень жыцця працоўных, павялічыліся іх рэальныя даходы. За 7 гадоў пабудавана столькі жылля, колькі было пабудавана за ўсе гады Сав. улады да 1958. Ідзе далейшы эканам. і культ. ўздым усіх саюзных рэспублік, шырацца іх эканам. сувязі і ўзаемадапамога. З'езд адзначыў і недавыкананне плана па асобных відах прадукцыі, адставанне с.-г. вытворчасці, запаволеныя ў апошнія гады сямігодкі тэмпы росту вытворчасці і прадукцыйнасці працы. З'езд ухваліў рашэнні кастрычніцкага і лістападаўскага (1964), сакавіцкага і вераснёўскага (1965) Пленумаў ЦК КПСС, якія выпрацавалі новы падыход да кіраўніцтва нар. гасп., меры па ўдасканаленні арганіз. дзейнасці партыі, паляпшэнні кіраўніцтва работай Саветаў, прафсаюзаў, камсамола. З'езд унёс змены ў Статут КПСС, накіраваныя на развіццё ўнутрыпарт. дэмакратыі, ініцыятывы і актыўнасці парт. арг-цый. Зменамі ў Статуце прадугледжана выбранне Палітбюро для кіраўніцтва работай партыі паміж Пленумамі ЦК КПСС, устаноўлена пасада Генеральнага сакратара ЦК КПСС. З'езд выказаў асн. ідэі і паліт. ўстаноўкі, паложаныя ў аснову пяцігадовага плана на 1966—70. Аб'ём капітальных укладанняў у нар. гасп. ў 1,5 раза перавышаў укладанні за папярэднія 5 гадоў і склаў 310 млрд. руб. Прадугледжваліся больш высокія тэмпы росту сукупнага грамадскага прадукту (у 1,4 раза), нац. даходу (на 38—41%) і рэальных даходаў насельніцтва (у 1,3 раза). Аб'ём прамысл. прадукцыі намечана павялічыць у 1,5, машынабудавання ў 1,6—1,7 раза, хім. прадукцыі ў 2 разы. З'езд намеціў курс на больш хуткае тэхн. пераўзбраенне нар. гаспадаркі, своечасовую замену ўстарэлай прадукцыі, паляпшэнне размяшчэння прадукц. сіл, комплекснае развіццё і спецыялізацыю гаспадаркі саюзных рэспублік і эканам. раёнаў. У БССР намечана павялічыць аб'ём прамысл. прадукцыі ў 1,7 раза, выпрацоўку эл. энергіі ў 2, перапрацоўку нафты у 4,4, вытворчасць мінер. угнаенняў у 3,8, хім. валокнаў у 3,2—3,7, прылад і сродкаў аўтаматызацыі ў 1,8, тканін у 2,4, трыкатажу ў 2 разы; стварыць нафтаздабыўную прамысловасць. Сярэднегадавы аб'ём с.-г. прадукцыі намечана павялічыць на 25%, збожжа на 30% у параўнанні з сярэднегадавой вытворчасцю папярэдніх 5 гадоў; дзярж. капіталаўкладанні ў с. гасп.— удвая. Намечана шырокая праграма меліярац. работ. Вял. задачы вызначаны па паляпшэнні матэрыяльнага і культ. становішча працоўных: павялічыць заработную плату рабочым і служачым у сярэднім на 20%, грашовыя выплаты і льготы за лік грамадскіх фондаў спажывання на 40%, увесці штомесячную гарантаваную аплату працы калгаснікаў, завяршыць у асноўным пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. З'езд прыняў заяву адносна агрэсіі ЗША ў В'етнаме.

З'езд выбраў ЦК у складзе 195 чл. і 165 канд.; Цэнтр. рэвіз. камісію ў складзе 79 чл. На Пленуме ЦК КПСС 8.4.1966 выбрана Палітбюро ЦК КПСС у складзе: чл. Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, А. П. Кірыленка, А. М. Касыгін, К. Т. Мазураў, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорны, Дз. С. Палянскі, М. А. Суслаў, А. М. Шалепін, П. Я. Шэлест; канд. В. В. Грышын, П. Н. Дземічаў, Дз. А. Кунаеў, П. М. Машэраў, В. П. Мжаванадзе, Ш. Р. Рашыдаў, Дз. Ф. Усціна, У. В. Шчарбіцкі; Генеральным сакратаром ЦК КПСС выбраны Л. І. Брэжнеў; сакратарамі ЦК КПСС Ю. У. Андропаў, П. Н. Дземічаў, І. В. Капітонаў, А. П. Кірыленка, Ф. Д. Кулакоў, Б. М. Панамароў, А. П. Рудакоў, М. А. Суслаў, Дз. Ф. Усціна, А. М. Шалепін; старшынёй Камітэта парт. кантролю пры ЦК КПСС А. Я. Пельшэ. Цэнтр. рэвіз. камісія выбрала старшынёй Г. Ф. Сізова.

Літ.: XXIII съезд Коммунистической партии Советского Союза. Стенографический отчет, ч. 1—2, М., 1966. *С. Л. Саламаха.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТЫ З'ЕЗД КПБ, адбыўся 17—19.2.1960 у Мінску. 702 дэлегаты з рашаючым голасам і 90 з дарадчым ад 183 855 чл. і 19 592 канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздача ЦК КПБ (К. Т. Мазураў); 2) Справаздача Рэвіз. камісіі КПБ (В. Я. Сядых); 3) Выбары ЦК КПБ; 4) Выбары Рэвіз. камісіі КПБ.

З'езд адзначыў поспехі ў развіцці прамысловасці, буд-ва і транспарту за справаздачны перыяд, прааналізаваў дзейнасць парт. арг-цый па выкананні сямігадовага плана. У нар. гасп. рэспублікі за 1956—59 укладзена 17,4 млрд. руб. (столькі, колькі за 8 папярэдніх гадоў). Найб. хуткімі тэмпамі развіваліся энергетыка, машынабудаванне, хім. прамысловасць і прамысловасць буд. м. Павялічыўся выпуск прадукцыі лёгкай, харч., мясцовай прамысловасці. Пабудавана і ўведзена ў дзеянне 25 буйных прамысл. прадпрыемстваў. Аб'ём прамысл. вытворчасці ў БССР у параўнанні з 1955 павялічыўся ў 1,6 раза, у т. л. вытворчасць сродкаў вытворчасці на 64%, прадметаў спажывання на 52%. Выпрацоўка эл. энергіі вырасла на 70% (у параўнанні з 1940 у 6 разоў), прадукцыя машынабудавання — больш чым у 2 разы. З'езд заклікаў камуністаў надалей забяспечыць апераджальнае развіццё цяжкай прамысловасці, перш-наперш энергетыкі. З'езд адзначыў некат. поспехі ў развіцці с. гасп. Расшырылася мат.-тэхн. база калг. і саўгаснай вытворчасці, палепшылася структура пасяўных плошчаў, грашовыя даходы калгасаў выраслі ў 1,4, непадзельныя фонды амаль у 2 разы. Павысіўся матэрыяльны і культ. ўзровень жыцця працоўных. У гарадах і рабочых пас. Беларусі пабудавана 140 тыс. новых кватэр (больш за 6 млн. м²), на вёсцы 101 тыс. дамоў. Большасць рабочых і служачых пераведзена на скарочаны рабочы дзень пры той самай і нават большай заработнай плаце. КПБ павысіла ўзровень прапаганды і агітацыі, яшчэ больш умацавала сувязі з масамі. Парт. арг-цыі палепшылі падбор, расстаноўку і выхаванне кадраў. Павялічылася колькасць камуністаў на вядучых участках вытворчасці. Выраслa роля Саветаў, прафсаюзаў і камсамола ў эканам. і культ. жыцці. З'езд патрабаваў ад парт. органаў павысіць узровень кіраўніцтва прамысловасцю, буд-вам, с. гасп., удасканальваць формы і метады парт. работы, забяспечыць далейшы рост ініцыятывы і самадзейнасці грамадскіх арг-цый, заклікаў камуністаў, працоўных рэспублікі шырэй разгарнуць сацыяліст. спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў сямігодкі.

З'езд выбраў ЦК КПБ у складзе 115 чл. і 51 канд., Рэвіз. камісію — 33 чл. Пленум ЦК 9.2.1960 выбраў Бюро ЦК КПБ: чл. А. І. Золаў, В. І. Казлоў, Ц. Я. Кісялёў, І. Ф. Клімаў, К. Т. Мазураў, І. М. Макараў, П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, С. К. Цімашэнка, Дз. Ф. Філімонаў, В. Ф. Шаура; канд. Л. Г. Максімаў, С. В. Прытыцкі. Сакратарамі ЦК КПБ выбраны К. Т. Мазураў, П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, В. Ф. Шаура, Дз. Ф. Філімонаў.

Літ.: Мазураў К. Т. Справаздачны даклад Центральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXIV з'езду, Мн., 1960; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 514—516. *І. І. Люблінская.* Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТЫ З'ЕЗД КПСС, адбыўся 30.3—9.4.1971 у Маскве. 4949 дэлегатаў прадстаўлялі 13 810 089 чл. і 645 232 канд. у чл. партыі. У рабоце з'езду ўдзельнічалі прадстаўнікі 102 камуніст. і рабочых, нац.-дэмакр. і левых сацыяліст. партый з 91 краіны свету.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КПСС (Л. І. Брэжнеў); 2) Справаздачны даклад Цэнтр. рэвіз. камісіі КПСС (Г. Ф. Сізоў); 3) Дырэктывы XXIV з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75 (А. М. Касыгін); 4) Выбары цэнтр. органаў партыі.

З'езд падвёў вынікі 8-й пяцігодкі; аднадушна ўхваліў паліт. лінію і практычную дзейнасць ЦК КПСС, прапановы і вывады, зробленыя ў справаздачным дакладзе; вызначыў паліт. лінію і навукова абгрунтаваную праграму на наступны перыяд; зацвердзіў Дырэктывы па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75; унёс частковыя змены ў Статут КПСС; прыняў Зварот «Свабоду і мір народам Індакітая!» і Заяву «За справядлівы і трывалы мір на Блізкім Усходзе». У дакументах і матэрыялах з'езду глыбока прааналізавана міжнар. становішча СССР, знешнепаліт. дзейнасць КПСС; адзначана, што за перыяд з XXIII з'езду КПСС (1966) адбыліся вялікія сацыяльна-паліт. змены ў свеце, абвастрылася барацьба паміж сіламі міру, свабоды, прагрэсу і сіламі прыгнёту, рэакцыі і агрэсіі. Сусв. сістэма капіталізму, агульны крызіс якой паглыбляецца, няраз спрабавала ўцягнуць чалавецтва ў ваен. авантуры і дала новыя доказы рэакцыйнай, агрэсіўнай прыроды імперыялізму. СССР у супрацоўніцтве з брацкімі сацыяліст. краінамі і інш. міралюбівымі дзяржавамі пры падтрымцы нар. мас свету паслядоўна адстойваў справу міру і даваў рашучы адпор сілам рэакцыі і агрэсіі. КПСС і Сав. дзяржава проціпаставілі агрэс. палітыцы імперыялізму выразную праграму актыўнай абароны міру і ўмацавання міжнар. бяспекі. З'езд адзначыў, што міжнар. пазіцыі СССР сталі яшчэ больш надзейныя, выраслa роля сусв. сістэмы сацыялізма, умацаваўся і паглыбіўся саюз асн. рэвалюц. сіл сучаснасці — сацыялізма, міжнар. рабочага руху і нац.-вызв. барацьбы народаў. З'езд пацвердзіў правільнасць сав. знешняй палітыкі, мэта якой — забяспечыць разам з інш. сацыяліст. краінамі спрыяльныя міжнар. ўмовы для пабудовы сацыялізма і камунізма; заклікаў умацоўваць адзінства і згуртаванасць сацыяліст. краін, іх дружбу і брацтва; падтрымліваць нац.-вызв. рух і ўсебакова супрацоўнічаць з маладымі краінамі, якія сталі на шлях развіцця; паслядоўна адстойваць прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным сац. ладам, даваць рашучы адпор агрэс. сілам імперыялізму, збавіць чалавецтва ад новай сусв. вайны. З'езд адзначыў, што паспяховым завяршэннем 8-й пяцігодкі сав. народ арабіў вялікі крок уперад у стварэнні мат.-тэхн. базы камунізма, у развіцці сацыяліст. грамадскіх адносін, павышэнні дабрабыту працоўных, выхаванні новага чалавека; выраслі маштабы, паскорана развіццё і палепшаны якасныя паказчыкі нар. гасп. Нац. даход СССР павялічыўся на 41%, вытворчасць прамысл. прадукцыі на 50%, сярэднегадавы аб'ём прадукцыі с. гасп. на 21%. Адбылося далейшае ўмацаванне сацыяліст. ладу, ідэйна-паліт. адзінства грамадства, саюзу рабочага класа і сялянства, дружбы і брацкага супрацоўніцтва народаў СССР, далейшы росквіт сав. сацыяліст. дэмакратыі;

павысіліся дабрабыт і культ. ўзровень жыцця насельніцтва; палепшана прафес.-тэхн. падрыхтаванасць рабочых і калгаснікаў, ароблены важны крок на шляху пераадолення істотных адрозненняў паміж горадам і вёскай, паміж фізічнай і разумовай працай. Сав. грамадства стала яшчэ больш аднароднае, гарманічнае, згуртаванае і магутнае. Умацавалася магутнасць і баяздольнасць Сав. Узбр. Сіл. Усё гэта стварыла перадумовы для новага ўздыму эканомікі і культуры, вырашэння складаных задач пяцігадовага плана развіцця нар. гасп. СССР на 1971—75, Дырэктывы па якім зацвердзіў з'езд. Галоўная задача пяцігодкі заключаецца ў тым, каб забяспечыць значны ўздым матэрыяльнага і культ. ўзроўню жыцця народа на аснове высокіх тэмпаў развіцця сацыяліст. вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, навукова-тэхнічнага прагрэсу і паскарэння росту прадукцыйнасці працы. З'езд падкрэсліў, што павышэнне дабрабыту народа — найвышэйшая мэта партыі, што гэты курс будзе вызначаць дзейнасць і агульную арыентацыю гасп. развіцця краіны на доўгі час. Дырэктывамі прадугледжана за 5 гадоў павялічыць нац. даход на 37—40%, у т. л. фонд спажывання на 40%, фонд накаплення на 37%; вытворчасць прамысл. прадукцыі на 42—46%; сярэднегадавую вытворчасць с.-г. прадукцыі на 20—22%; рэальныя даходы на душу насельніцтва амаль на $^1/_3$. Хутка будзе развівацца эканоміка ўсіх саюзных рэспублік, у т. л. БССР (вытв. прамысл. прадукцыі Беларусі павялічыцца на 53—56%). З'езд адзначыў, што цяжкая індустрыя і надалей астанецца фундаментам эканам. магутнасці краіны і росту дабрабыту народа, пацвердзіў і развіў раней распрацаваную партыяй доўгачасовую комплексную праграму развіцця с. гасп.; прызнаў за неабходнае ўсямерна расшыраць вытворчасць прамысл. тавараў нар. спажывання; падкрэсліў, што гал. шлях паскарэння развіцця эканомікі — павышэнне прадукцыйнасці працы, эфектыўнасці грамадскай вытворчасці на аснове навук.-тэхн. прагрэсу і выкарыстання пераваг сацыяліст. сістэмы гаспадаркі; што неабходна паляпшаць выкарыстанне прац. рэсурсаў, вытв. фондаў і капіталаўкладанняў; зніжаць прац. затраты, павышаць якасць прадукцыі, узмацняць рэжым эканоміі, удасканальваць планаванне і кіраванне нар. гасп. на навук. аснове. З'езд намеціў шырокую праграму сац.-паліт. развіцця сав. грамадства, якая прадугледжвае далейшае ўмацаванне вядучай ролі рабочага класа, саюзу рабочага класа і сялянства, маральна-паліт. адзінства сав. грамадства; збліжэнне класавых і сац. груп, усіх нацый і народнасцей, няўхільнае развіццё сацыялісц. дэмакратыі, усё больш актыўнае далучэнне мас да вырашэння грамадскіх і дзярж. спраў; далейшы росквіт усіх сацыялісц. нацый. З'езд паставіў задачу развіваць навуку, культуру, адукацыю; выхоўваць сав. людзей у духу камуніст. светапогляду і свядомых адносін да працы, сав. патрыятызму і інтэрнацыяналізму, непрымірымасці да бурж. ідэалогіі.

З'езд аддаў вял. ўвагу ўнутр. жыццю партыі, яе развіццю, задачам арганіз. і ідэалаг. работы. Адзначыў, што КПСС, цвёрда ідучы ленінскім курсам, з гонарам выконвае ролю паліт. кіраўніка рабочага класа і ўсіх працоўных, вядзе сав. народ верным дарогай да камунізма. За справаздачны перыяд у партыю прынята 3 млн. чл., больш палавіны з іх рабочыя; КПСС, захоўваючы ленінскія нормы парт. жыцця, яшчэ больш умацавала свае рады, сувязь з масамі, узбагацілася вопытам паліт. і арганіз. работы. З'езд прызнаў за неабходнае і надалей павышаць кіруючую ролю партыі, дабівацца адзінства дзеянняў і поглядаў камуністаў, усіх сав. людзей; паляпшаць дзейнасць найважнейшага звяна партыі — пярвічных парт. арг-цый, арганіз. і паліт. работу ў масах, падбор, расстаноўку і выхаванне кадраў; развіваць крытыку і самакрытыку, калект. кіраўніцтва. З'езд падкрэсліў, што вернасць марксісцка-ленінскаму вучэнню, навук. асэнсаванне з'яў грамадскага жыцця і яго гал. тэндэнцый дае партыі магчымасць прадбачыць ход грамадскіх працэсаў, выпрацаваць правільны паліт. курс, пазбягаць памылак і суб'ектывісцкіх рашэнняў. З'езд заклікаў яшчэ больш развіваць тэорыю, павышаць узровень работы навук. устаноў, дабівацца цеснай сувязі грамадскіх навук з практыкай парт. і дзярж. работы, з вырашэннем задач камуніст. буд-ва; узмацніць барацьбу супраць бурж. ідэалогіі, рэфармізму і рэвізіянізму; паляпшаць марксісцка-ленінскую адукацыю камуністаў, цясней звязваць паліт. вучобу з канкрэтнымі задачамі камуніст. буд-ва, узмацняць уздзеянне паліт. вучобы на рост свядомасці і актыўнасці ўсіх чл. партыі. З'езд унёс частковыя змены ў Статут КПСС: даў права кантролю дзейнасці адміністрацыі пярвічным парт. арг-цыям устаноў і арг-цый, функцыі адміністрацыі якіх не выходзяць за рамкі сваіх калектываў; пастанавіў, што чарговыя з'езды КПСС і кампартый саюзных рэспублік склікаюцца раз у 5 гадоў, змяніў тэрміны склікання чарговых краявых, абл., акр., гар. і раённых канферэнцый.

З'езд выбраў ЦК у складзе 241 чл. і 155 канд. і Цэнтр. рэвіз. камісію КПСС. Пленум ЦК, які адбыўся 9.4.1971, выбраў Палітбюро ЦК КПСС. Чл.: Л. І. Брэжнеў, Г. І. Воранаў, В. В. Грышын, А. М. Касыгін, А. П. Кірыленка, Ф. Д. Кулакоў, Д. А. Купаеў, К. Т. Мазураў, М. В. Падгорны, Дз. С. Палянскі, А. Я. Пельшэ, М. А. Суслаў, А. М. Шалепін, У. В. Шчарбіцкі, П. Я. Шэлест; канд. Ю. У. Андропаў, П. Н. Дземічаў, П. М. Машэраў, В. П. Мжаванадзе, Ш. Р. Рашыдаў, Дз. Ф. Усціна ў. Генеральным сакратаром ЦК КПСС выбраны Л. І. Брэжнеў, сакратарамі ЦК КПСС П. Н. Дземічаў, І. В. Капітонаў, К. Ф. Катушаў, А. П. Кірыленка, Ф. Д. Кулакоў, В. М. Панамароў, М. С. Саломенцаў, М. А. Суслаў, Дз. Ф. Усціна ў; старшынёй К-та парт. кантролю пры ЦК КПСС — А. Я. Пельшэ. Старшынёй Цэнтр. рэвіз. камісіі КПСС выбраны Г. Ф. Сізоў.

Літ.: Матэрыялы XXIV з'езду КПСС. Мн., 1971.

У. М. Сікорскі. Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ШОСТЫ З'ЕЗД КПБ, адбыўся 3—5.3.1966 у Мінску. 724 дэлегаты з рашаючым голасам і 57 з дарадчым ад больш як 343 тыс. чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздача ЦК КПБ (П. М. Машэраў); 2) Справаздача Рэвіз. камісіі КПБ (І. П. Кожар); 3) Праект Дырэктыў XXIII з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1966—70 (Ц. Я. Кісялёў); 4) Выбары ЦК КПБ; 5) Выбары Рэвіз. камісіі КПБ.

З'езд падкрэсліў, што КПБ на аснове навук. вырашэння праблем нар. гасп. ўзмацніла ўплыў на ўсе ўчасткі вытворчасці, больш канкрэтна кіравала Саветамі, прафсаюзамі, камсамолам, павышаючы іх ролю ў камуніст. буд-ве. Гал. ўвага была сканцэнтравана на развіцці прамысловасці. Аб'ём прамысл. вытворчасці рэспублікі за 4 гады павялічыўся ў 1,5, за сямігодку — у 2,1 раза замест 1,8, прадугледжаных кантрольнымі лічбамі; асн. фонды прамысловасці — у 2,3 раза. На 8 мес. раней тэрміну выкананы 7-гадовы план па агульным аб'ёме вытворчасці. Апераджальнымі тэмпамі развіваліся энерг., машынабуд., хім., радыётэхн. і інш. вядучыя галіны прамысловасці. Палепшана размяшчэнне прадукц. сіл, створаны новыя галіны прамысловасці: нафтаперапрацоўчая, мінер. угнаенняў, электронная. Уведзена ў дзеянне больш як 300 буйных прамысл. прадпрыемстваў і цэхаў. Створана магутная база па вытворчасці буд. матэрыялаў. Ажыццёўлен пераход да галіновага прынцыпу кіравання прамысловасцю. Значная работа праведзена па арганіз.-гасп. умацаванні калгасаў і саўгасаў. Валавая прадукцыя с. гасп. за сямігодку павялічылася ў 1,7, у т. л. жывёлагадоўлі ў 2,1, продаж дзяржаве збожжа, малака, мяса, яец больш чым у 2 разы. Амаль падвоіліся грашовыя даходы калгасаў. Развівалася навука і культура. З'езд адзначыў і недавыкананне заданняў сямігодкі многімі прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі, памылкі ў планаванні капітальных укладанняў і арг-цый буд-ва. З'езд абавязаў ЦК, абкомы, гаркомы і райкомы партыі палепшыць арганіз.-парт. і ідэалаг. работу, узмацніць ролю парт. арг-цый у гасп. і культ. буд-ве, вызначыў гал. задачы ў развіцці прамысловасці і с. гасп. рэспублікі. З'езд ухваліў праект Дырэктыў XXIII з'езду КПСС па пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. СССР на 1966—70, які вызначыў эканам. задачу новай пяцігодкі: на аснове дасягненняў навукі і тэхнікі, індустр. развіцця грамадскай вытворчасці забяспечыць далейшы рост прамысловасці, высокія ўстойлівыя тэмпы развіцця с. гасп. з тым, каб больш поўна задаволіць матэрыяльныя і культ. патрэбы насельніцтва. Аб'ём прамысл. вытворчасці ў БССР намечана павялічыць у 1,7 раза пры апераджальных тэмпах развіцця энергетыкі, нафтаздабыўной, нафтаперапрацоўчай, хім. прамысловасці і машынабудавання. Гал. задача ў галіне с. гасп.— значна павялічыць вытворчасць прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі, каб паўней задаволіць патрэбы насельніцтва ў харч. прадуктах, якія ўсё больш растуць. Прадугледжана ўдвая павялічыць капітальныя ўкладанні на ўмацаванне мат.-тэхн. базы с. гасп.

З'езд выбраў ЦК у складзе 133 чл. і 59 канд., Рэвіз. камісію — 40 чл. Пленум ЦК КПБ 5.3.1966 выбраў Прэзідыум ЦК: чл. В. І. Каплоў, Ц. Я. Кісялёў, У. Е. Лабанок, І. М. Макараў, П. М. Машэраў, С. А. Пілатовіч, С. В. Прытыцкі, І. Я. Палякоў, А. А. Смірноў, Ф. А. Сурганаў, Дз. Ф. Філімонаў; канд. Г. М. Жабіцкі, С. С. Марахін. Сакратарамі ЦК КПБ выбраны П. М. Машэраў, Ф. А. Сурганаў, С. В. Прытыцкі, Дз. Ф. Філімонаў, С. А. Пілатовіч.

Літ.: Машэраў П. М. Справаздача Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі XXVI з'езду. Мн., 1966; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 574—578.

С. Л. Саламаха. Мінск.

ДВАЦЦАЦЬ ШЭСЦЬ БАКІНСКІХ КАМІСАРАЎ, гл. *Бакінскія камісары.*

ДВОЕЎЛАДДЗЕ, своеасаблівае перапляценне двюх улад у Расіі пасля звяржэння царызму ў выніку *Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917*: дыктатуры буржуазіі ў асобе Часовага ўрада і рэвалюц.-дэмакр. дыктатуры рабочых і сялян у асобе Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Скарыстаўшы недастатковую арганізаванасць і свядомасць мас, лідэры буржуазіі захапілі ўладу і стварылі 27.2(12.3).1917 Часовы выканаўчы к-т Дзярж. думы. Адначасова ўзніклі Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, якія выказвалі інтарэсы пралетарыяту і бядняцкай часткі сялянства. 27.2 (12.3).1917 Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў створаны ў Петраградзе. Аднак большасць дэпутацкіх месцаў у Саветах захапілі меншавікі і эсэры, пры згодзе якіх 2(15) сак. Часовы выканаўчы к-т Дзярж. думы сфарміраваў бурж. Часовы ўрад. Не маючы дастатковай рэальнай сілы, Часовы ўрад мусіў дзяліць уладу з Саветамі, якія падтрымлівалі узбр. народ. Адсюль вынікала магчымасць ліквідацыі Д., перамогі пралет. рэвалюцыі мірным шляхам, таму ў *Красавіцкіх тэзісах У. І. Леніна* абвешчаны лозунг «Уся ўлада Саветам!». У першыя дні рэвалюцыі Саветы ўзніклі і ў інш. гарадах.

На Беларусі 4 сак. створаны Мінскі Савет рабочых дэпутатаў, 6 сак. створаны аб'яднаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, 4 сак. выбраны Гомельскі Савет рабочых дэпутатаў, а 6 сак. створаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў у складзе 135 чал. ад 25 тыс. рабочых і салдатаў. 8 сак. адбыўся ўстаноўчы сход 300 дэпутатаў Віцебскага Савета. Да сярэдзіны сак. створаны і дзейнічалі Бабруйскі, Слуцкі, Барысаўскі, Аршанскі, Полацкі, Рэчыцкі і інш. Саветы. Адначасова на Беларусі дзейнічалі органы Часовага ўрада ў асобе губернскіх і павятовых камісараў. У Мінску 4 сак. ўтворацы т. зв. Часовы грамадскі камітэт парадку, у Гомелі ўзнік Камітэт грамадскай бяспекі і дабрабыту. Д. скончылася пасля *ліпеньскіх дзён 1917.* 9(22) ліп. ВЦВК Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і выканком Усерас. Савета сялянскіх дэпутатаў абвясцілі аб прызнанні неабмежаваных паўнамоцтваў Часовага ўрада. Усю паўнату ўлады захапіла буржуазія, а эсэраўскаменшавіцкія Саветы ператварыліся ў прыдатак Часовага ўрада.

Літ.: Ленін У. І. Аб задачах пралетарыята ў данай рэвалюцыі.— Аб двоеўладдзі.— Задачы пралетарыята ў нашай рэвалюцыі, Тв., т. 24 (Полн. собр. соч., т. 31); Яго ж. Тры крызісы, Тв., т. 25 (там жа, т. 32); Яго ж. Да лозунга Тв., т. 25 (там жа, т. 34).

В. Р. Гняўко. Мінск.

ДВОР, 1) на Беларусі да 17 ст.— сталае жыллё адной ці некалькіх сем'яў, звязаных сваяцкімі сувязямі; часам паняцці Д. і сям'я тоесныя (гл. *Дварышча*).

У 17—18 ст. Д., або «дым»,— асобная гаспадарка, з якой спаганяліся падаткі і павіннасці. Цэлыя Д. адбывалі паншчыну (прыгон), асадныя плацілі аброк натураю (даніну), грашыма (чынш). Часам Д. называўся па прыналежнасці гаспадара

да саслоўя ці катэгорыі пасельніцтва (панскі, шляхецкі, мяшчанскі, купецкі, сялянскі, бабылёў, агародніка і інш.) або па выкарыстанні Д. як службы (гасціны, гандлёвы, манетны, друкарскі, казённы, пасталлы, скацінны і інш.). Паводле забудовы сялянскія Д. на Беларусі падзяляюцца на вяжковыя (па Пн і У) і пагонныя (на Пд і З). Вяжковыя забудаваны з 4 бакоў або ў выглядзе літары «П». У пагонным Д. хата і гасп. пабудовы размешчаны пад адной страхою ў адзін рад (аднарадны пагонны Д.) ці ў 2 паралельныя рады (двухрадны пагоны Д.).

2) У Ст. Русі (з 2-й пал. 15 ст.) участак зямлі з жылымі і гасп. пабудовамі, які належаў аднаму гаспадару.


Падзяляліся на цяглыя (чорныя), што будаваліся гандлёвымі, майстравымі, пасадскімі і інш. людзьмі на падатковай зямлі, за якую плацілі падаткі і адбывалі павіннасці, і няцяглыя (белыя, асадныя), якія даваліся ва ўмоўнае, асабістае, часовае ўладанне вольным служылым людзям без спагнання падаткаў. З 2-й пал. 18 ст. Д., або дваровым месцам, лічылася нерухомая маёмасць аднаго ўладальніка, якая не падлягала раздраблению пры пераходзе ў спадчыну, але магла быць падзелена на часткі пры продажы.

3) Д. княскі (спачатку — княскі стан), рэзідэнцыя нач. княскай дружыны, у 15—16 ст. жыллё і рэзідэнцыя вял. князя; 4) Д. гасудара, палац цара (імператара), яго сям'і і світы з вышэйшых саноўнікаў, якая ўкамплектоўвалася па строга вызначаным штаце прыдворных чыноў. Да Д. належалі і асобы з вярхоў пануючых класаў, якія не служылі пры двары, але мелі доступ у прыдворныя колы.

ДВОР БАБЧА, вёска ў Каменскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Палітаддзел». За 25 *км* на ПнУ ад Лепеля, 93 *км* ад Віцебска, каля шашы Лепель — г. п. Ула (3 *км*). 128 ж., двароў 36 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, вет. пункт, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДВОР НІЗГАЛАВА, вёска ў Бачэйкаўскім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., каля р. Ула (1 *км*). Цэнтр калгаса імя Дзімітрова. За 25 *км* на З ад Бешанковіч, 76 *км* ад Віцебска, 23 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, каля шашы Чашнікі — г. п. Ула (0,5 *км*). 93 ж., гасп. 36 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік 98 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДВОРЖАК (Dvořák) Антанін (8.9.1841, в. Нелагазевес каля Прагі — 1.5.1904), чэшскі кампазітар. Заснавальнік (разам з Б. Сметанам) чэш. муз. класікі, стваральнік нац. сімфоніі. Апіраючыся на чэш., славацкі, мараўскі фальклор, Д. рэалістычна глыбока адлюстраваў у сваёй творчасці найважнейшыя вехі гісторыі, рысы характару і быту свайго народа. Вучыўся ў Пражскай школе арганістаў (1857—59). Ужо раннія творы — опера «Кароль і вугальшчык» (1871), 4 сімфоніі, патрыят. кантата «Гімн» (1872) — прынеслі Д.



вядомасць. З сярэдзіны 70-х г. азначаецца паварот у бок нац. акрэсленасці музыкі. Д. стварыў «Мараўскія дуэты», «Славянскія танцы» (2 серыі, 1878—86), апрацоўкі чэш. і славацкіх нар. песень, увёў у класічны цыкл як асобныя часткі п'есы нац. характару — думку, фурыянт. Уласцівасці сталага стылю Д. ярка выявіліся ў 5—8-й сімфоніях (1875, 1880, 1884—85, 1889), уверцюрах «Мая радзіма», «Гусіцкая», канцэртах для фп., скрыпкі, віяланчэлі з арк., у операх 80-х г. («Дзімітрый», «Якабінец»). У 1892—95 дырэктар Нац. кансерваторыі ў Нью-Порку. Цікавасць да негрыцянскага і індзейскага фальклору адбілася на 9-й сімфоніі «З Новага свету» (e-moll op. 95, 1893), якая абагульніла драм. тэндэнцыі творчасці Д. У апошнія гады шмат гастраляваў як дырыжор, выкладаў кампазіцыю, узначальваў Пражскую кансерваторыю (з 1901). Сярод твораў гэтага часу — камічная опера «Чорт і Кача» (1899), казачна-паэтыч. «Русалка» (1900), 5 сімф. паэм, рэквіем.

Літ.: Бэлза И. Антонин Дворжак. М.—Л., 1949; Смирнов М. Фортепьянное творчество А. Дворжака. М., 1960; Антонин Дворжак. Сб. ст., М., 1967; Дворжак в письмах и воспоминаниях, пер. с чеш., М., 1964. *Т. А. Шчарбакова.* Мінск.

ДВОРЖАЦ Макс Аляксандравіч [4(16).4. 1891, Ковенская губ.— 1942], беларускі савецкі вучоны ў галіне афтальмалогіі. Праф. (1936). Скончыў мед. ф-т Варонежскага ун-та (1919). Ардынатар, асістэнт, дацэнт БДУ (1924—30), заг. кафедры вочных хвароб Мінскага мед. ін-та (1932—41). Асн. працы па вывучэнні ядраў вочных рухальных нерваў, па прафілактыцы траўмаў вачэй, этыялогіі і лячэнні трахомы, арг-цыі дапамогі хворым на вочныя хваробы.

Тв.: Профессиональные повреждения и заболевания глаз, Мн., 1937; Аб найбольш небяспечных хваробах вачэй, Мн., 1938; у кн.: Сборник работ к XV-летию Белорусского государственного медицинского ин-та, Мн., 1939.

ДВОРНАВА, вёска ў Лужоўскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Прагрэс». За 35 *км* на У ад Шаркоўшчыны, 202 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Падсвілле, каля шашы Глыбокае — Дзісна (1,5 *км*). 52 ж., гасп. 21 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, магазін. Помнік 63 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДВОРНАЕ СЯЛО, вёска ў Наўгародскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «За мір». За 8 *км* на ПдУ ад Міёраў, 198 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Міёры. 228 ж., гасп. 79 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт. Помнік землякам — воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДВОРНІКАЎ Мікалай Мікалаевіч [парт. псеўд. Стах Тамашэвіч; 6(19).12.1907, Гомель — 16.2.1938], дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З рабочых. Чл. КПСС з 1929. З 1929 на камсамольскай рабоце — сакратар камсамольскай арг-цыі «Гомсельмаша», Цераховскага, Жлобінскага РК ЛКСМБ, заг. аддзела і чл. бюро ЦК ЛКСМБ. З ліст. 1932 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі — сакратар Беластоцкага, потым Брэсцкага акруговых к-таў КСМЗБ, з ліст. 1933 чл. сакратарыята

ЦК КСМЗБ, з жн. 1935 першы сакратар ЦК КСМЗБ. Удзельнік барацьбы (1937—38) супраць фашызму ў Іспаніі — камісар польскага батальёна імя Палафокса, камандзір украінскай роты імя Т. Шаўчэнкі ў складзе інтэрнацыянальнай брыгады імя Я. Дамброўскага. Загінуў у час штурму фаш. паліцый у гарах Эстрэмадуры. Імем Д. названы вуліцы ў Гомелі і Брэсце; на доме, дзе ён нарадзіўся і жыў, на будынку «Гомсельмаша» — мемарыяльныя дошкі.



Літ.: Архіва М. С. Жыцце, аддадзенае барацьбе. Стах Тамашэвіч, «Полымя», 1959, № 4; Ласковіч В. Мікалай Дворнікаў на Брэстчыне, там жа, 1968, № 2; Драбінскі Я. Ад Гомеля да Эстрамадуры. «Маладосць», 1968, № 5—6.

С. Р. Анісаў. Мінск.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Дзямідавіцкім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Фрунзе. За 24 *км* на Пн ад Дзяржынска, 34 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Фанішаль. 374 ж., двароў 97 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, аддз. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, сталовая, магазін.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Кыжма. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дворышча». За 15 *км* на ПнУ ад Ліды, 147 *км* ад Гродна, на шашы Ліда — в. Тракелі. 263 ж., двароў 78 (1971). Торфапрадпр. «Дворышча», камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну, мемарыяльная дошка на ўшанаванне іх памяці.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Расонскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр Краснаборскага с/с і калгаса імя Кутузава. За 24 *км* на ПдУ ад Расонаў, 160 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Дрэтунь, на шашы г. п. Расоны — в. Краснаполле. 98 ж., гасп. 39 (1971). Сепаратарны пункт Расонскага маслазавода. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Хойніцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 5 *км* на ПдЗ ад Хойнікаў, 108 *км* ад Гомеля, 10 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 1815 ж., гасп. 472 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДВОЯК (польск. dwojak), сярэбраная манета Вял. княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай вартасцю ў 2 грошы. Упершыню выпушчаны *Віленскім манетным дваром* у 1565, чаканіліся ў Быдгашчы (1650—52, 1654), Торуні (1651), Гданску (1651—53), Эльблангу (1651) і Варшаве (1766—82, 1785—86).

ДВУЖЫЛЬНЫ Юрый Міхайлавіч (25.8.1919, чыг. ст. Канстанцінаўка Бахмуцкага пав. Екацярынаслаўскай губ.— 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. Батальён пад камандаваннем капітана Д. 23—24. 6.1944 фарсіраваў Проню, Басю, захапіў варожыя траншэі, вызваліў в. Суслаўка, Папоўка; 25 чэрв. за 5 гадзін адбіў 6 контратак праціўніка. Загінуў у баі. Пахаваны ў в. Харошкі. Сухараўская сярэдняя школа Чавускага р-на названа яго імем.

ДВУХГАДОВЫЯ РАСЛІНЫ, расліны, якія жывуць на працягу 2 вегет. перыядаў. У першы год развіваюцца вегетатыўныя органы (карані, укарочаны парастак з прыкаранёвай разеткай лісця); на другі год за кошт назапашаных пажыўных рэчываў утвараецца прадаўгаваты парастак з кветкамі, якія даюць плады з насеннем, увосень расліны адміраюць. Сярод Д. р. шмат харчовых (*морква, рэдзька, капуста, буракі* і інш.), дэкаратыўных (*браткі, гваздзік, званочак, мальва* і інш.), лекавых (*анхуза, блёкат, букашнік, наперстаўка* і інш.).

Літ.: Жуковский П. М. Ботаника, 4 изд., М., 1964; Киселев Г. Е. Цветоводство, 3 изд., М., 1964.

ДВУХГАЛОВЫ АРОЛ, геральдычная эмблема на дзярж. гербе Расійскай манархіі з 15 ст. да 1917; уведзена вял. князем маскоўскім Іванам III Васілевічам на ўзор візантыйскага герба.

Літ.: Лукомский В. К. и Типольт Н. А. Русская геральдика, П., 1915.

ДВУХДОЛЬНЫЯ (Dicotyledoneae), клас пакрытанасенных раслін. Больш за 175 тыс. відаў, аб'яднаных у 350—360 сям., у флоры БССР больш за 1000 відаў. Да іх належаць шмат карысных дрэўных і травяністых раслін: дрэвы (*дуб, бяроза, ліпа, клён, таполя* і інш.), большасць пладовых (*яблыня, груша, слівa, вішня*, персік і інш.), кармавыя і харчовыя (*боб кармавы, фасоля, гарбуз, дыня, бульба, грэчка, буракі* і інш.), лекавыя, алейныя, дубільныя, дэкаратыўныя.

Характэрныя прыкметы: дзве семядолі ў зародку; сеткаватае жылкаванне лісця; стрыжнёвы корань; спец. ўтваральная тканка ў сцяблах — камбій (абумоўлівае рост сцябла ў таўшчыню); кветкі пераважна пяцічленнага тыпу.

Літ.: Проханов Я. И. Возникновение двудольных многолетних трав (факты и гипотезы), у кн.: Проблемы филогении растений, М., 1965 (Труды Московского об-ва испытателей природы, т. 13).

ДВУХКЛАСНЫЯ ПАЧАТКОВЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ, пачатковыя школы павышанага тыпу ў Расіі з тэрмінам навучання 5—6 гадоў.

Узніклі ў 70-я г. 19 ст. Існавалі ў вял. сёлах, на асобных чыг. станцыях і ў некат. павятовых гарадах. Навучаліся ў іх пераважна дзеці заможных сялян, гандляроў, саматужнікаў. Першыя тры гады навучання лічыліся 1-м класам і адпавядалі курсу пач. школы, 4—6-ы гады складалі курс 2-га класа. Навучанне раздзельнае. Вывучалі: «закон божы», рус. мову і чыстапісанне, арыфметыку, рас. гісторыю, геаграфію. Вучні набывалі элементарныя звесткі па прыродазнаўстве, фізіцы, геаметрыі і чарчэнні. З 1875 уведзены неабавязковыя прадметы: гімнастыка, рамёслы, рукадзелле, садоўніцтва, агародніцтва, пчалярства. У 1910 на тэр. Віленскай навуч. акругі было 297 Д. п. в. з 5-гадовым і 116 з 6-гадовым тэрмінам навучання. У 1918 Д. п. в. ператвораны ў школы 1-й і 2-й ступеняў.

М. К. Кірылаў. Масква.

ДВУХКРЫЛЫЯ (Diptera), атрад насякомых. Каля 85 000 відаў, пашыраных ва ўсім свеце. У СССР каля 20 000.



Муха цэцэ.

Даўж. цела Д. 1—50 *мм*. Маюць адну пару перапончатых крылаў (задняя пара ператварылася ў жужальцы). Ротавыя органы сысучыя. Галава шарападобная, паўшарападобная ці плясканат. На баках галавы складаныя (фасетачныя) вочы; між іх 2—3 простыя вочкі. Развіццё з поўным ператварэннем. Многія Д. (*камары, слепні, масхіты*) пераносчыкі ўзбуджальнікаў малярыі, тулярэміі, энцэфаліту і інш. хвароб. Шведская, гесенская, капусная, вішнёвая мухі — шкоднікі с.-г. раслін. Значная роля Д. як апыляльнікаў раслін.

Літ.: Бей-Биенко Г. Я. Общая энтомология, М., 1966; Определитель насекомых Европейской части СССР, т. 5, ч. 1, Л., 1969.


ДВУХПАЛАТНАЯ СІСТЭМА, прынцып будовы заканадаўчых органаў, пры якім яны складаюцца з 2 палат. У СССР вышэйшы заканадаўчы орган — Вярх. Савет СССР — складаецца з дзвюх раўнапраўных палат: Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей. Гэта абумоўлена тым, што СССР — шматнацыянальная дзяржава. Такая структура Вярх. Савета СССР забяспечвае ахову агульных інтарэсаў усіх працоўных і спецыфічных інтарэсаў усіх нацыянальнасцей.

У бурж. краінах Д. с. створана, каб не дапусціць выяўлення сапраўднай волі прац. мас. Палаты маюць розныя паўнамоцтвы і дзейнічаюць паасобна. Верхнія палаты — своеасаблівы тормаз у адносінах да ніжніх палат. Іх члены або назначаюцца зверху (сенат Канады, палата лордаў у Англіі), або выбіраюцца на аснове ўскосных выбараў, абмежаваных павышанымі цэнзамі (Савет рэспублікі ў Францыі). Гэта забяспечвае больш рэакцыйны склад верхніх палат. Тэрмін іх паўнамоцтваў больш доўгі, чым ніжніх; яны маюць большыя правы, часам могуць накладваць вета на законапраекты, ухваленыя ніжнімі палатамі.

Літ.: Верховный Совет СССР. [Зб. матэрыялаў], М., 1967; Парламенты зарубежных стран. Справочник, М., 1968; Парламенты, пер. с англ., М., 1967.

ДВУХРЭЧЧА, пашыраная назва *Месапатамії*.

ДВУХХВОСТКІ, вілахвосткі (Diplura), адзін з найб. прымітыўных атрадаў насякомых. Вядома каля 400 відаў. У СССР каля 20 відаў.



1 — кампадэя; *2* — япікс.

Цела Д. прадаўгаватае, густа пакрытае валаскамі. Даўж. 2—8 *мм*. Вусікі ніткападобныя. Вачэй няма. На заднім канцы цела парныя, пакшталт вілаў, прыдаткі (адсюль назва). Жывуць у глебе, лясным подсціле, гнілой драўніне. Драпежнікі (жывяцца дробнымі членістаногімі).

Літ.: Гл. пры арт. *Насякомыя*.

ДВУХЧЛЕН, тое, што *біном*.

ДЖ, графема ў беларускім алфавіце. Дыграф, утворан з літар «д» і «ж». Для абазначэння афрыката «дж» упершыню пастарабел. кніжнікі гук «дж» найчасцей перадавалі літарамі «ч», «ж», спалучэннем літар «д» і «ч». У сучаснай бел. мове абазначае афрыкату «дж» («дожджык», «дрожджы»).

ДЖАБАРЛЫ Джафар (20.3.1899, в. Хізы каля Баку — 31.12.1934), азербайджанскі вецкі пісьменнік. Пачынальнік сацыяліст. рэалізму ў азерб. драматургіі. Засл. дз. маст. Азерб. ССР (1932). Скончыў Азерб. ун-т (1929). З 1929 працаваў заг. літ. часткі і рэжысёрам Азерб. акад. драм. т-ра імя Азізбекава. Друкавацца пачаў у 1915. Першыя п'есы, апавяданні, сатыр. вершы накіраваны супраць сац. няроўнасці, бяспраўя жанчыны. У п'есах, напісаных пасля Кастр. рэв., выкрываў ілжывую бурж. мараль («Айдын», паст. 1922; «Актай эль аглы», 1923), услаўляў барацьбу азерб. народа за свабоду і сац. справядлівасць («Нявеста агню», паст. 1928; «У 1905 годзе», паст. 1931), заклікаў да поўнага разняволення жанчыны-азербайджанкі («Севіль», паст. 1928). Класавую барацьбу на вёсцы паказаў у п'есах «Алмас» (паст. 1931) і «Яшар» (паст. 1932). Ідэйная насычанасць, вастрыня драм. канфліктаў, па-майстэрску пабудаваны дыялог — уласцівасці найлепшых твораў Дж. Аўтар паэмы «Дзявочая вежа» (1923), лібрэта опер «Шахсенэм» і «Сефа».

Тв.: Рус. пер.— Пьесы, Баку, 1969.

Літ.: Ариф М. Творчество Джафара Джабарлы, Баку, 1961; Очерк истории азербайджанской советской литературы, М., 1963.

ДЖАВАХІШВІЛІ Гіві Дзмітрыевіч [н. 18.9 (1.10).1912, Тыфліс], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. Старшыня Савета Міністраў Груз. ССР. З сям'і ўрача. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Закаўказскі індустрыяльны ін-т (1934), Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП(б) (1948). З 1934 нач. гідрагеалагічнай экспедыцыі Ін-та курорталогіі Мін-ва аховы здароўя Груз. ССР. У 1941—44 на парт. і сав. рабоце. З 1944 у апараце ЦК КП Грузіі: нам. заг. аддзела, сакратара ЦК КП(б) Грузіі па паліўнай і энерг. прамысловасці, заг. аддзела цяжкай прамысловасці. З вер. 1952 старшыня выканкома Тбіліскага гар. Савета дэп. працоўных. З 1953 старшыня Савета Міністраў Груз. ССР. На XX, XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 4—8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



ДЖАГАРАЎ Георгі (н. 14.7.1925, в. Бяла Слівенскай акругі), балгарскі паэт і драматург. Нар. дз. культ. НРБ (1971). Чл. БКП з 1944. Скончыў Літ. ін-т імя М. Горкага ў Маскве (1951). З 1966 старшыня Саюза пісьменнікаў БНР. Друкуецца з 1941. Аўтар зб. вершаў «Мае песні» (1955), «Лірыка» (1956), «У хвіліны маўчання» (1958), сац.-псіхал. драм «Дзверы зачыняюцца» (1960), «І заўтра дзень» (1963), «Пракурор» (1965, Дзімітроўская прэмія 1966). Чл. ЦК БКП з 1966.



Тв.: Бел. пер.— у кн.: Ад стром балканскіх, Мн., 1965; у час.— «Маладосць», 1958, № 9; «Беларусь», 1969, № 9; рус. пер.— На колени не падать, М., 1961.

Н. С. Гілевіч. Мінск.

ДЖАЗ (англ. jazz), род прафесійнай музыкі. Склаўся ў ЗША на мяжы 19—20 ст. на аснове сінтэзу элементаў еўрап. музыкі і самабытнай муз. культуры амер. неграў (асн. віды фальклору патомкаў завезеных з Афрыкі неграў-рабоў — абрадавыя танцы, рабочыя песні, духоўныя песні спірычуэлс, лірычныя песні блюзы, гарадскі танц.-бытавы жанр рэгтайм). Ад негрыцянскай музыкі ідуць характэрныя Дж. вызначальная функцыя рытму, імправізацыйнасць, інтанацыйны строй, які дапускае адхіленні ад тэмперацыі, шырокае ўжыванне прыёму глісанда.

Слова Дж. стала ўжывацца ў канцы 10-х г. 20 ст. для азначэння музыкі невялікіх ансамбляў, заснаванай на калектыўнай імправізацыі (нью-арлеанскі стыль, стваральнікі Дж. Олівер, Л. Армстранг, Дж. Мортан, С. Бешэ). У пач. 30-х г. у Дж. устаўляваўся стыль свінг (Ф. Хендэрсан, У. Бейсі, Э. К. Эліінтан, Б. Д. Гудмен і інш.), якому ўласцівыя выкарыстанне вял. складу аркестра, нотная фіксацыя акампанементу, імправізацыя салістаў. У канцы 30-х г. пачынае развівацца жанр камернага Дж. У пач. 40-х г. Ч. Паркер, Дж. Гілеспі, Т. Монк стваралі стыль бі-боп з насычанымі дысанансамі тэмамі, ускладненай гармоніяй, свабоднай імправізацыяй, не звязанай з пач. мелодыяй. Вызначальныя рысы Дж. 60-х г.— цікавасць да формаў ранняга сімфанізму і муз. культур Афрыкі і Азіі. Развіццё найноўшага Дж. адбываецца ў вострай барацьбе рэаліст. і фармаліст. тэндэнцый, адлюстроўвае сац., расавы і культ. крызіс, які перажываюць ЗША, наогул капіталіст. Захад. На працягу ўсёй сваёй гісторыі Дж. рабіўся аб'ектам камерцыйнай эксплуатацыі. Прыёмы імправізацыйнага Дж. мелі ўплыў на творчасць многіх кампазітараў 20 ст. Асобныя элементы Дж. выкарыстоўваюцца сав. эстраднымі аркестрамі (А. Цфасмана, Л. Уцёсава, А. Варламава і інш.), малыя вак.-інстр. ансамблі (пашырающца з канца 50-х г.) карыстаюцца прынцыпамі Дж. для апрацоўкі песень і танцаў народаў СССР (такі бел. ансамбль «Песняры»).

Літ.: Конен В. Пути американской музыки, 2 изд., М., 1965; Мысовский В. и Фейертаг В. Джаз, Л., 1960; Чернов А. и Вялик М. О легкой музыке, о джазе, о хорошем вкусе, М.— Л., 1965.

ДЖАЙНІЗМ, рэлігійна-філасофскае вучэнне, якое ўзнікла каля 6 ст. да н. э. ў Індыі. Заснавальнікам лічыцца Вардхамана Махавіра, празваны Джынай (на санскр. пераможца). Пашырэнне вучэння Дж. абумоўлена нарастаннем класавых супярэчнасцей і нездаволенасцю шырокіх мас саслоўна-каставымі абмежаваннямі.

У процілегласць *брахманізму* Дж. адмаўляе боскі падзел людзей на касты і лічыць, што лёс чалавека вызначаецца яго асабістымі якасцямі. Паводле вучэння Дж. не існуе адзінага бога-творца. Сусвет бясконцы і ніхто не створаны. Усе істоты маюць жыватворчы пачатак — душу. У сувязі з гэтым джайны аддаюць вялікае значэнне прынцыпу ахімсы — непрычынення зла жывому. У чалавека вызначаюцца дзве сутнасці: матэрыяльная (цела) і духоўная (душа). Бессмяротнай і вечнай душа па чарзе жыве ў розных целах, умовы жыцця якіх — адплата за ўчынкі, зробленыя душою ў мінулых пераўвасабленнях. Каб душа дасягнула вечнай асалоды і абавілася ад пераселенняў і пакут, чалавек павінен выконваць правілы, выпрацаваныя ў Дж., і маўкліва скарацца лёсу. Як і ўсякая рэлігія, Дж. апраўдвае сац. прыгнёт і паралізуе рэвалюц. актыўнасць працоўных.

Літ.: Гусева Н. Р. Джайнизм, М., 1968; Александров Г. Ф. Очерк истории социальных идей в древней Индии, Мн., 1959; Радхакришнан С. Индийская философия, пер. с англ., т. 1, М., 1956.

Ю. М. Манін. Мінск.

ДЖАКАРТА (Djakarta), сталіца, паліт. і эканам. цэнтр Інданезіі. Размешчана на ПнЗ в-ва Ява на ўзбярэжжы Яванскага м. Вузел чыг. і шашэйных дарог, міжнар. аэрапорт. За 10 *км* ад Дж. марскі аванпорт Танджунгпрыяк, праз які праходзіць больш паловы імпарту Явы і каля $^2/_5$ экспарту ўсёй Інданезіі (каўчук, кава, чай, хінін і інш.). 4,6 млн. ж. (1969). З прыгарадамі ўтварае асобную сталічную акругу. Прамысловасць машынабуд., харчасмакавая, тэкстыльная, швейная, паліграфічная, гарбарна-абутковая і інш. Прадпрыемствы: суднаремонтны з-д у Танджунгпрыяку, суднабуд. верф, чыг. майстэрні, ф-ка мыла і харч. тлушчаў, аўтазборачныя з-ды, абутковая ф-ка. Перапрацоўка с.-г. сыравіны (у т. л. каўчуку). Рамесныя майстэрні. 2 ун-ты, Навук. савет Інданезіі (Акадэмія навук), некалькі НДІ, больш за 10 ін-таў, тэхн. вучылішчы. Музеі: Джакарцкі, гарадскі, карціннай галерэя.

У 16 ст. на месцы сучаснай Дж. знаходзіўся г. Сундакелапа, перайменаваны ў 1527 у Джакатру. У пач. 17 ст. разбураны галандцамі, якія ў 1619 на яго месцы пабудавалі крэпасць Батавію. Горад, што вырас вакол крэпасці, у 1621 атрымаў тую ж назву. Цэнтр нац.-вызв. барацьбы інданез. народа. 17.8.1945 тут абвешчана незалежнасць Інданезіі, горад стаў сталіцаю Рэспублікі Інданезія (у 1946—49 сталіца часова была ў Джак'якарце). З 1949 наз. Джакартай. У Старым горадзе — будынкі галандскай архітэктуры 17—18 ст., каналы. Новы горад (засн. у 1808) мае прамавугольную планіроўку, шырокія вуліцы і плошчы (пл. Свабоды з палацам прэзідэнта) з грамадскімі будынкамі, атэлямі, асабнякамі. Пасля 1945 узніклі новыя жылыя раёны, пабудаваны горад-спадарожнік Кебаёран (1947—58). Сярод будынкаў сучаснай архітэктуры шэраг збудаванняў, створаных сав. архітэктарамі: шпіталь (1962—63, Л. Грышаеў), спарт. комплекс (1959—62, Р. Семерджыеў, Л. Мурамцаў і інш.). Манумент Незалежнасці (1967, скульптар М. Манізер).

ДЖАЛІЛЬ (Джаліл аў) Муса Мустафіевіч [2(15).2.1906, в. Мустафа Арэнбургскай губ.— 25.8.1944], татарскі савецкі паэт. Герой Сав. Саюза (1956). Чл. КПСС з 1929. Сын селяніна. Скончыў Маск. ун-т (1931). У 1920—27 на камсамольскай рабоце. Працаваў рэдактарам тат. дзіцячых часопісаў, супрацоўнічаў у газетах. З 1934 узначальваў літ. аддзел тат. оперный студыі пры Маск. дзярж. кансерваторыі, з 1938 — літ. частку Тат. оперната т-ра (з 1953 імя Мусы Джаліля). Напісаў некалькі оперных лібрэта (найлепшае — «Залатавалосая», 1941, Дзярж. прэмія СССР 1948). У 1939—41 адказны сакратар Саюза пісьменнікаў Тат. АССР. З 1941 у Сав. Арміі. 26.6.1942 цяжка паранены траплю у палон. За ўдзел у падпольнай антыфаш. арг-цыі, якую стварыў у канцлагеры, пакараны смерцю ў ваен. турме Шпандаў (Берлін). Друкавацца пачаў у 1919. Радасць стваральнай працы, магутны поступ маладой Сав. Рэспублікі паказаў у першым аб. вершаў і паэм «Мы



ідзём!» (1925). Аўтар зб. «Таварышу» (1929), «Ардэнаносныя мільёны» (1934), «Клятва артылерыста» (1942), «Лісты з акопа» (на рус. мове, 1944). У 2-й пал. 30-х г. напісаў паэмы «Джыган», «Дырэктар і сонца», «Джым», «Пісьманосец», насычаныя пачуццём гордасці за чалавека-творцу, будаўніка новага свету. Вяршыня творчасці Дж.— напісаны ў 1942—43 у Маабіцкай турме цыкл вершаў «Маабіцкі сшытак» (Ленінская прэмія 1957). У ім ярка выявілася вера ў перамогу сав. народа над фаш. захопнікамі. На бел. мову творы Дж. перакладалі М. Аўрамчык, М. Калачынскі, П. Прыходзька, Я. Семяжон.

Тв.: Бел. пер. у час.— «Полымя», 1957, № 5; «Маладосць», 1956, № 2, 1966, № 2; «Беларусь», 1966, № 2; рус. пер.— Избранное, М., 1955; Сочинения, Казань, 1962; Избр. произв., Казань, 1969; Моабитская тетрадь, М., 1969.

Літ.: Бикмухаметов Р. Г. Муса Джалиль, М., 1966; Воздвиженский В. Г. «Моабитские тетради» Мусы Джалиля, М., 1969; Аўрамчык М. Пясняр мужнага змагання, «Маладосць», 1966, № 2; Муса Джалиль. (Библиография. 1919—1961). Сост. А. Г. Каримуллин. Казань, 1961.

І. У. Саламевіч. Мінск.

ДЖАЛЮК Аляксандр Паўлавіч (1905, в. Мацішэўка Бельскага пав. Гродзенскай губ.— 26.5.1944), беларускі савецкі журналіст-публіцыст. Чл. КПСС з 1926. У 1924—28 на камсамольскай рабоце. У 1929—30 рэдактар рэсп. маладзёжнай газ. «Чырвоная змена». У 1930—32 вучыўся ва Усесаюзным камуніст. ін-це журналістыкі імя «Правды», пасля заканчэння якога з 1932 да 1937 працаваў адказным сакратаром, потым нам. рэдактара газ. «Звязда». Адначасова рэдагаваў час. «Бальшавіцкі друк» (1933—36). У 1939—40 намеснік, потым рэдактар газ. «Бальшавіцкая трыбуна» (Барысаўскі р-н Мінскай вобл.). Аўтар артыкулаў па пытаннях тэорыі і практыкі бальшавіцкага друку. Удзельнік Вял. Айч. вайны. Узнаг. ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём.

А. Л. Матусевіч. Мінск.

ДЖАМБУЛ ДЖАБАЕЎ [16(28).2.1846, Сямірэчча — 22.6.1945], казахскі народны паэт-акын. Сын бедняка-качэўніка. У творах, складзеных да Кастр. рэв., выкрываў прыгнятальнікаў народа, выказваў імкненне заняволеных працоўных да лепшай будучыні («Доля беднякa», «Песня гнеўнага сэрца»). Паэмы «Утэгенбатыр» і «Сураншы-батыр» пра герояў нац.-вызв. барацьбы каз. народа. У творах сав. часу славіў Камуніст. партыю, поспехі сацыяліст. буд-ва. У паэзіі Дж. пераважае эпічны пачатак, асабліва ў творах пра Айч. вайну («Ленінградцы, дзеці маі!», «Маскве», «На смерць сына»). Тэма многіх вершаў — дружба народаў («Песня пра Маскву», «Братэрства народаў»). Вершы і паэмы Дж. перакладзены на многія мовы народаў СССР, у т. л. на беларускую, і за мяжою. Я. Купала і Я. Колас прысвяцілі акыну вершы «Джамбулу». Дзярж. прэмія СССР 1941. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі.



Тв.: Бел. пер.— Песні і паэмы, Мн., 1939; рус. пер.— Избр. произв., Алма-Ата, 1958; От всего сердца, М., 1966.

Літ.: Зелинский К. Джамбул, М., 1955; Творчество Джамбула, Алма-Ата, 1956; Исмаилов Е. Акыны, Алма-Ата, 1957.


ДЖАМБУЛ (да 1936 Аўліе-Ата), горад, цэнтр Джамбулскай вобл. Казахскай ССР, на р. Талас. Чыг. вузел, аэрапорт. 188 тыс. ж. (1970). 2 суперфасфатныя з-ды, ДРЭС, аб'яднанне «Джамбулскурабутак», ф-ка пачатковай апрацоўкі воўны, цукр. камбінат, з-ды спірта-гарэлачны і камунальнага машынабудавання. Вытворчасць буд. матэрыялаў, ін-ты: тэхналагічны, лёгкай і харч. прамысловасці, гідрамеліярацыйна-будаўнічы, педагагічны, 5 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Казахскі і рускі драм. тэатры, філармонія. Краязнаўчы музей.

Вядомы з 7 ст. пад назвай Тараз ці Талас. У 10 ст. значны цэнтр караваннага гандлю. У 13 ст. разбураны манголамі. У 18 ст. тут пабудавана крэпасць Аўліе-Ата. З 1864 у складзе Рас. імперыі. Пункт гандлю жывёлай і прадуктамі жывёлагадоўлі. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. Названы ў гонар каз. нар. паэта *Джамбула Джабаева*. Паблізу Д. помнікі сярэднеазіяцкага феад. дойлідства — маўзалеі Бабаджы-хатум (11 ст.) і Айша-бібі (12 ст.).

ДЖАМБУЛСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе Казахскай ССР. Утворана 14.10.1939. Пл. 144,6 тыс. км². Нас. 795 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 10 раёнаў; 4 гарады, 11 гар. пас. Цэнтр г. Джамбул.

Паверхня пераважна раўнінная, занятая глінісцай пустыняй Бетпак-Дала і пяскамі Муюнкум. На Пд паўн. схілы Кіргізскага хр. выш. да 3817 м, на ПдУ горы Жальтау, Айтау і Кіндыктас (выш. да 1520 м), па ПдЗ хр. Каратау выш. да 1610 м. Карысныя выкапні: фасфарыты, каляровыя металы, кам. вугаль, спажыўная соль, гіпс, мармур, салетра. Клімат рэзка кантынентальны, на раўнінах тэр. вельмі сухі (ападкаў 100—200 мм за год). Сярэдняя т-ра ліп. каля 23, студз. —10; —12 °С. У перадгор'ях сярэдняя т-ра ліп. 20—22, студз. —5, —8 °С, ападкаў да 350 мм за год. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Асн. рэкі Чу, Талас, Аса, выкарыстоўваюцца на арашэнне. Азёры Балхаш (паўдзах. ч.), Біліколь, Аколь (прэсныя), Ашчыколь (салёнае) багатыя на рыбу. Глебы на раўніне і перадгор'ях бурыя пустынныя і шэраземы, месцамі такыры і саланчакі. У гарах горныя каштанавыя і чарназёмы, вышэй за 2000 м горныя чарназёмы і горна-лугавыя. Расліннасць палынна-салянкавая, у перадгор'ях палынна-злакавая і кавыльна-пёркавая. На пясках зараснікі саксаулу. У гарах злакава-разнатраўныя стэпы і разрэджаныя лясы з асіны і цяньшаньскай елкі. Вышэй за 2100 м субальпійскія і альпійскія лугі. Асн. насельніцтва казахі і рускія. Жывуць украінцы, беларусы, узбекі, дунгане, карэйцы. Сярэдняя шчыльн. 5,5 чал. на 1 км². Гарадскога насельніцтва 40% (1970). Гарады: Джамбул, Каратау, Чу, Жанатас.

Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці павялічылася ў 1968 у параўнанні з 1940 у 13 разоў. За гады Сав. улады створаны горнарудная, хім., харч., лёгкая прамысловасць і буд. індустрыя. У Каратау горнахімічны камбінат па здабычы фасфарыту, у Джамбуле 2 суперфасфатныя з-ды. Прадпрыемствы цукровай (Джамбул, Чу, Айтал), мясной, рыбнай, спірта-гарэлачнай, піўной, мукамольнай (Джамбул), малочнай, сыра-масларобчай (Джамбул, Каратау і раённыя цэнтры) прамысловасці. У Джамбуле абутковы камбінат, ф-кі пачатковай апрацоўкі воўны, швейная і



мэблевая. У Георгіеўцы гарбарны камбінат. Машынабудаванне і прадпрыемствы буд. матэрыялаў у Джамбуле. Энергетычная база прамысловасці — вугаль з Караганды, Ангрэна, Ленгера і прыродны газ з Бухары. У 1969 выпрацавана 1852 млн. *кват·гадз* эл. энергіі. Асн. галіны с. гасп.— паліўное і багарнае земляробства, мяса-воўнавая і мяса-малочная жывёлагадоўля. У 1970 у вобласці было 56 калгасаў і 70 саўгасаў, агульная плошча арашоных зямель 221,6 тыс. *га*. Пасяўная плошча ўсіх с.-г. культур у 1969 (тыс. *га*) 956, з іх пад збожжавымі 710,8, тэхнічнымі 38,3, агародніна-бахчавымі і бульбай 14,8, кармавымі 192,1. Гал. збожжавыя культуры пшаніца (442,5 тыс. *га*) і ячмень (255 тыс. *га*). З тэхнічных — цукр. буракі (37,1 тыс. *га*). Садоўніцтва і вінаградарства. У 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 275,8 (у т. л. кароў 108,9), свіней 74,2, авечак і коз 2556,4. Даўж. чыгунак 1033 *км* (1970). Па тэр. вобласці праходзіць Казахская чыг. з адгалінаваннямі Джамбул — Жанатас, Лугавой — Фрунзе, Чу — Маінты. Ін-ты: гідрамеліярацыйна-будаўнічы, тэхналагічны лёгкай і харч. прамысловасці, педагагічны; 6 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Казахскі і рускі драм. тэатры, філармонія. Краязнаўчы музей. Абл. газета «Знамя труда» (на рускай і казахскай мовах).

Літ.: Советский Союз. Казахстан, М., 1970.

С. А. Абдрахманаў. Алма-Ата.

ДЖАМІ Абдурахман Нурэдзін ібн Ахмад [7.11.1414, Джам (Харасан) — 9.11.1492], персідскі і таджыкскі пісьменнік і вучоны. Настаўнік і сябар Алішэра *Наваі*. Аўтар прац па л-ры, гісторыі, філасофіі, тэалогіі, рыторыцы, музыцы і інш., трох зб. газеляў, «Семярыцы» — зборніка з сямі паэм («Дар праведнікам», «Лейлі і Меджнун», «Кніга мудрасці Іскандэра», «Юсіф і Зулейха» і інш.). Карыстаўся ўсімі традыц. паэт. жанрамі. Майстар віртуознай паэт. формы. Творчасць Дж. супярэчлівая: ад рэакц. ідэй рэліг. нецярпімасці і абскурантызму ён узняўся да пратэсту супраць дэспатызму і сац. несправядлівасці, ад містычнай абмежаванасці да вялікіх філас. абагульненняў і пропаведзі гуманіст. ідэй.

Тв.: Рус. пер.— Избранное, М., 1964; Трактат о музыке, Ташкент, 1960; Весенний сад, Душанбе, 1964; Лирика о слове и поэтах. Притчи и рассказы из Месневи, Душанбе, 1964; Саламан и Абсаль, Душанбе, 1967.

Літ.: Хашим Р. Имя, прославленное в веках, Душанбе, 1964; Урунбаев А. и Епифанова Л. М. (сост.). Рукописи произведений Абдаррахмана Джами в собрании Ин-та востоковедения АН УзССР, Ташкент, 1965.

«ДЖАНГАР», калмыцкі гераічны эпас. Створаны ў 15 ст. Услаўляе волатаў легендарнага хана Джангара — самаадданых змагароў за нац. незалежнасць калм. народа, носьбітаў яго найлепшых рысаў і запаветных спадзяванняў. Мае некалькі варыянтаў. Урыўкі з «Дж.» ўпершыню надрукаваны ў 1804—05. Самы поўны запіс (10 песень) 1910. У «Дж.» апяваецца дзівосная краіна Бумба, у якой пануюць вечнае шчасце і маладосць. Цалкам запісаны і апублікаваны ў сав. час (1935, 1936, 1940). На бел. мову паасобныя раздзелы эпасу пераклі. Э. Агняцвет і М. Клімковіч.

Публ.: Рус. пер.— Джангар, М., 1958.

Літ.: Козин С. А. Джангарнада, М.—Л., 1940; Сікар Е. Бессмяротны гераічны твор калмыцкага народа, «Полымя рэвалюцыі», 1940, № 5; О Джангаре. Сб. материалов, Элиста, 1963.

ДЖАНСУГУРАЎ Ільяс (1.5.1894, аул № 4 Аксуйскай вол. Капальскага пав.— 1937), казахскі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1924. З сялян. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Маскве (1928). Друкавацца пачаў у 1915. Значны ўплыў на творчасць Дж. зрабіў фальклор. У творах 20-х г. апяваў сацыяліст. пераўтварэнні ў ауле (зб. «Бет-ашар», 1927; «Аснова», 1928), дружбу народаў («Прывітанне Беларусі», «Масква — Казахстан»). Найлепшыя паэмы «Стэп» (1930), «Кюйшы» (1935), «Кулагер» (1936). Глыбокі лірызм, разнастайнасць формаў вершаскладання, меладычнасць — рысы паэзіі Дж. Аўтар рамана «Таварышы» (1933), п'ес «Помста», «Турксіб», «Ісатай — Махабет» (1936), зб. сатыр. твораў «Кук» (1935), літ.-крытычных артыкулаў.

Тв.: Рус. пер.— Рассказы и фельетоны, Алма-Ата, 1958; Стихи и поэмы, М., 1962; Кулагер. Стихи и поэмы, Алма-Ата, 1967; Крылья ненависти, Алма-Ата, 1967.

Літ.: Очерк истории казахской советской литературы, М., 1960.

ДЖАПАРЫДЗЕ Пракоп Апрасіёнавіч [парт. псеўд. Алёша; 3(15).1.1880, в. Шардаметы Рачынскага пав. Кутаіскай губ.— 20.9.1918], прафесійны рэвалюцыянер. Чл. Камуніст. партыі з 1898. Вучыўся ў Тыфліскім настаўніцкім ін-це. Працаваў у Тыфліскай арг-цыі РСДРП. Адзін з кіраўнікоў бакінскай стачкі

1904. У 1904—05 чл. Бакінскага і Каўказскага саюзнага к-таў РСДРП. У 1906—08 працаваў у бальшавіцкіх выданнях, з 1905 сакратар праўлення саюза нафтапрамысл. рабочых. У 1914 узначаліў Тыфліскую бальшавіцкую арг-цыю, вёў рэвалюц. прапаганду на Каўказскім фронце. Няраз быў арыштаваны і зняволены (1900, 1908, 1911, 1915). Пасля Лют. рэв. 1917 чл. Бакінскага к-та РСДРП(б). З 1918 старшыня Бакінскага Савета, камісар унутр. спраў і нарком харчавання Бакінскага СНК. На VI з'ездзе РСДРП(б) выбраны канд. у чл. ЦК. Расстраляны англ. інтэрвентамі і эсэрамі ў ліку 26 *бакінскіх камісараў*.

ДЖАПАРЫДЗЕ Уча Малакіевіч [н. 4(17).8. 1906, сяло Гары Кутаіскай губ.], грузінскі савецкі жывапісец і графік. Нар. мастак СССР (1963), правадз. чл. АМ СССР (1958). Чл. КПСС з 1944. Вучыўся ў Нар. маст. студыі І. Таідзе і ў Тбіліскай АМ (1924—25, 1928—31; яе выкладчык з 1936, праф. з 1944). Сярод работ Дж.: «Сябры юнацтва» (1938), «Першамайская дэманстрацыя ў Тыфлісе ў 1901 г.» (1939—41), партрэт У. Чхеідзе (1943), «Думкі маці» (1945) і інш.; іл. да паэмы І. Чаўчавадзе «Разбойнік Како» (1952—53). Дзярж. прэмія СССР 1942.

Літ.: Уча Малакиевич Джапаридзе, М., 1953.

ДЖАРДЖОНЕ (Giorgione; сапр. Джорджа Барбарэлі да Кастэльфранка; 1477 ці 1478, Кастэльфранка — 1510), італьянскі жывапісец. Пачынальнік Высокага Адраджэння ў Венецыі. Вучыўся ў майстэрні Дж. Беліні. Услаўляў высакароднасць, прыгажосць, шчасце чалавека. Героі Дж. звычайна паглыблены ў роздум, самасузіральнасць, часта з адценнем меланхоліі («Юдзіф», каля 1502), у партрэтах — вобразы людзей з тонкім і складаным духоўным жыццём. Важнае месца ў творчасці Дж. заняла новая, свецкая тэматыка («Навальніца», 1506—07; «Тры філосафы», 1506—07; «Сельскі канцэрт», каля 1508—10). У карцінах Дж. ярка выяўлены адзін з прынцыпаў венецыянскай школы — паказ чалавека ў адзінстве з прыродай, пейзаж у Дж.— сфера існавання яго герояў, носьбіт іх паэт. настрою («Спячая Венера», 1507—08). Дж. быў выдатным каларыстам, дасягаў рэдкай насычанасці таноў, багацця і тонкасці іх спалучэнняў. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Адраджэнне*.

Літ.: Смирнова И. Джорджоне, М., 1955.

ДЖГІРЫ, яршы (Acerina), род рыб сям. акунёвых. Водзяцца пераважна ў прэсных водах Сярэдняй і Усх. Еўропы і Паўн. Азіі. На Беларусі 2 віды: Дж. звычайны (A. cernua) і Дж.-насар (A. acerina).

Даўж. Дж. звычайнага да 15 см, маса да 50 г. Першы спінны плаўнік і першыя прамяні анальны На жаберных накрыўках да 12 вострых шыпоў. Рыла тупое, кароткае. Колер цёмна-шэры. Насяляе ўсе рэкі, азёры і вадасховішчы. Жыве чародамі. Прыдонная рыба. Корміцца беспазваночнымі, ікрою і маляўкамі каштоўных рыб. Джгір-насар жыве ў рэках бас. Дняпра. Ад джгіра звычайнага адрозніваецца прадаўгаватым целам, дробнымі рыбамі, святлейшаю афарбоўкай, цёмнымі плямамі на баках і плаўніках.



Джгір-насар.

Літ.: Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965 (бібліягр.).

ДЖОНС (Jones) Эрнест Чарлз (25.1.1819—26.1.1869), дзеяч англійскага і міжнар. рабочага руху, паэт і публіцыст. З арыстакр. сям'і, адвакат. Адзін з лідэраў левага, рэвалюц. крыла *чартызму*. З 1847 чл. *Саюза камуністаў*. Цесная сувязь з К. Марксам і Ф. Энгельсам сфарміравала светапогляд Дж. Быў зняволены (1848—50). У 50-я г. змагаўся за адраджэнне чартызму на сацыяліст. аснове. У 1854 па яго ініцыятыве ў Манчэстэры скліканы Рабочы парламент. Дж. выступаў супраць панавання Англіі ў Індыі, Ірландыі і інш. краінах. Прапагандаваў ідэі навук. камунізма, выступаў за сувязь эканам. і паліт. барацьбы рабочых. Найб. значныя паэт. творы Дж. («Чартысцкія вершы», паэма «Паўстанне Індастана») прысвечаны тэме класавай барацьбы ў Англіі.

Тв.: Рус. пер.— Статьи о чартистской программе. Письма, М., 1970.


Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 8—11 (гл. Паказальнік імён); Галкин В. Эрнест Джонс, у кн.: Маркс и Энгельс и первые пролетарские революционеры, М., 1961.

ДЖОНСАН (Jonson) Бенджамін ці Бен (11. 6.1573, Лондан — 6.8.1637), англійскі драматург і паэт эпохі Адраджэння. З сям'і муляра. У трагедыях на тэмы з рымскай гісторыі «Падзенне Сеяна» (паст. 1603) і «Змова Катыліны» (1611) выявіліся гуманіст. і свабодалюбныя ідэі, накіраваныя супраць паліт. дэспатызму. Найб. творчае дасягненне Дж.— сатыр. камедыі нораваў, у якіх высмейваюцца маральныя заганы бурж.-арыстакр. грамадства («Вальпоне, ці Ліс», 1607; «Варфаламееўскі кірмаш», паст. 1614; «Алхімік», паст. 1610; і інш.). Напісаў каля 30 т. зв. масак — невялікіх алегарычных п'ес на міфалаг. сюжэты. Аўтар зб. лірычных вершаў «Лес» (1616). Адзін з першых высока ацаніў творчасць свайго сучасніка У. Шэкспіра.

Тв.: Рус. пер.— Пьесы, Л.— М., 1960.

Літ.: Ромм А. Бен Джонсон. 1573—1637, Л.—М., 1958.

ДЖОНСАН (Johnson) Х'юлет (25.1.1874, Манчэстэр — 22.10.1966), англійскі грамадскі дзеяч. З сям'і фабрыканта. У 10—20-я г. 20 ст. адзін з кіраўнікоў англіканскай царквы ў Манчэстэры, у 1931—63 настаяцель Кентэрберыйскага сабора. Вялікі сябар Сав. Саюза. У 2-ю сусв. вайну выступаў за хутчэйшае адкрыццё другога фронту ў Еўропе, быў адным з ініцыятараў збору сродкаў для дапамогі СССР. У 1945 Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Многія гады быў прэзідэнтам Т-ва англа-сав. дружбы, член бюро Сусв. Савета Міру. Няраз наведваў СССР. Аўтар праўдзівых кніг і артыкулаў пра СССР. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1950.



Тв.: The socialist sixth of the world, London, 1939; Soviet strength. Its source and challenge, 2 ed., London, 1943; Soviet success, London, [1947]; Eastern Europe in the socialist world, London, 1955.

ДЖОРДЖ (George) Генры (2.9.1839—29.10. 1897), амерыканскі публіцыст і дробнабурж. эканаміст. У працах «Прагрэс і беднасць» (1879, рус. пер. 1896), «Што такое адзіны падатак і чаму мы яго дабіваемся» (1891, рус. пер. 1907) і інш. лічыў, што нацыяналізацыя зямлі бурж. дзяржавай ці высокі падатак на прыватную зямельную ўласнасць ліквідуюць збяднення мас у бурж. грамадстве. У. І. Ленін пісаў: «Змяшанне прыватнай уласнасці на зямлю з панаваннем капіталу ў земляробстве ёсць характэрная памылка буржуазных нацыяналізатараў зямлі (Джорджа ў тым ліку і многіх іншых)» (Тв., т. 13, с. 365).

ДЖОРДЖТАЎН (Georgetown), сталіца, эканамічны цэнтр Гаяны. Засн. ў 1781. Порт на ўзбярэжжы Атлантычнага ак., чыг. станцыя. 186 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1969). Лесапільні, цукр. з-ды. Харч. і лёгкая прамысловасць. Вываз баксітаў, гліназёму, цукру, драўніны, золата, алмазаў. Вядомы бат. сад і сабор (1889—92), які лічыцца самай вялікай драўлянай царквою ў свеце.

ДЖОРДЖЫЯ (Georgia), штат на Пд ЗША. Пл. 152,6 *км*². Нас. 4641 тыс. чал. (1969), з іх больш за 30% — негры. Адм. ц. Атланта, вял. горад і порт Савана. На ПнЗ — перадгор'і Апалачаў (1458 *м*), плато Даланега і Підмант, на ПдУ — Прыатлантычная нізіна. Клімат субтрапічны, мяккі і вільготны. У гарах лясы. На Пд і ПдУ многа балот. Аснова эканомікі — с. гасп. Гал. культуры — бавоўна і кукуруза. Пасевы тытуню, землянога арэха. Вырошчваюць паўд. садавіну і раннюю агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу, свіней. Прамысловасць папярова-цэлюлозная, баваўняная, дрэваапр., авіяцыйна-ракетная, машынабуд., харчовая. Транспарт пераважна чыгуначны і аўтамабільны. Суднаходства па рэках Савана, Алтамахо з прытокам Акмалгі, Чатахучы.

ДЖОТА (Giotto; 1266 ці 1276, Коле-ды-Веспіньяна — 8.1.1337), італьянскі жывапісец Протарэнесансу. Пачынальнік рэалізму ў італьян. жывапісе. Вучань і паслядоўнік П'етра Каваліні. Мастацтва Дж. вызначалася вял. выяўленчай сілай і драм. выразнасцю вобразаў. Дж. рэзка парваў з адцягненасцю і аскетызмам сярэдневяковага мастацтва і ўпершыню ў поўнай меры сцвердзіў думку пра каштоўнасць рэальнага чалавечага жыцця. Традыц. рэліг. сюжэты ён напаўняў простым жыццёвым зместам. Вобразы людзей трактаваў жыва і наглядна, процілстаўляў іх рэліг.-абстрактным вобразам сярэдневякоўя. Дж. ўвёў у жывапіс інтэр'ер; не ведаючы яшчэ навук. перспектывы, паказваў трохмерную прастору, выкарыстоўваючы для гэтага і колер. Асаблівую ўвагу аддаваў аб'ёмнай пластычнасці фігур і прадметаў. Гал. работа Дж.— роспіс Капэлы дэль Арэна ў Падуі (каля 1305), якому характэрныя яснасць замыслу, строгая манументальнасць, сіла чалавечых пачуццяў, перададзеных у вобразах святых. У ц. Санта Крочэ ў Фларэнцыі ім распісаны 2 капэлы (Перуцы, каля 1320; Бардзі, каля 1325). Вядомы і як архітэктар, стварыў праект кампаніллы (званіцы) сабора Санта-Марыя дэль Ф'ёрэ. Ілюстрацыю гл. да артыкула *Адраджэнне*.



Літ.: Алпатов М. В. Итальянское искусство эпохи Данте и Джотто, М.—Л., 1939 (бібліягр.); Данилова И. (сост.). Джотто, М., 1970.

ДЖОЎЛЬ (Joule) Джэймс Прэскат (24.12. 1818—11.10.1889), англійскі фізік. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (з 1850). У 1841 адкрыў закон, які вызначае колькасць цеплыні, што выдзяляецца пры праходжанні эл. току па правадніку (гл. *Джоўля — Ленца закон*). Экспериментальна вызначыў механічны эквівалент цеплыні. З У. *Томсанам* адкрыў *Джоўля — Томсана эфект*. Адкрыцці Дж. адыгралі вял. ролю ў доследным абгрунтаванні закону захавання і ператварэння энергіі.


Літ.: Спасский Б. И. История физики, ч. 1, М., 1963, с. 317—321.

ДЖОЎЛЬ, адзінка вымярэння работы, энергіі і колькасці цеплыні ў сістэме СІ. Названа ў гонар англ. фізіка Дж. П. *Джоўля*. Абазначаецца *дж* або J. 1 Дж — работа сілы ў 1 ньютан, якая перамяшчае цела на 1 *м* у напрамку дзеяння сілы. 1 *дж* = 10^7 эргаў = 0,2388 калорыі. Гл. таксама *Сістэмы адзінак*.

ДЖОЎЛЯ — ЛЕНЦА ЗАКОН, закон, паводле якога колькасць цеплыні, што выдзяляецца ў правадніку пры праходжанні па ім эл. току, прапарцыянальная супраціўленню правадніка, квадрату току і часу яго праходжання: $Q = RI^2t$, дзе Q — колькасць цеплыні ў *дж*, R — супраціўленне ў *ом*, I — ток у *а* і t — час у *сек*. Закон адкрыты ў 1841 англ. фізікам Дж. П. *Джоўлем* і незалежна ад яго ў 1842 рус. фізікам Э. Х. Ленцам. На Дж.— Л. з. заснаваны разлік электраасвятляльных установак, усіх награвальных і ацяпляльных электрапрылад.

ДЖОЎЛЯ — ТОМСАНА ЭФЕКТ (дроселыны эфект), змена т-ры газу пры яго дроселяванні — расшырэнні праз звужаную адтуліну (вентыль, пористую перагародку) без выканання знешняй работы і без цеплаабмену з навакольным асяроддзем. Выяўлены ў 1853—54 англ. вучонымі Дж. П. *Джоўлем* і У. *Томсанам*.

Дж.— Т. э. абумоўлены ўзаемадзеяннем паміж малекуламі газу. Калі пераважаюць сілы прыцягнення, газ пры дроселяванні ахалоджваецца (дадатны Дж.— Т. э.), калі пераважаюць сілы адштурхоўвання, газ награецца (адмоўны Дж.— Т. э.). Калі сілы прыцягнення і адштурхоўвання ўраўнаважаны, т-ра газу не мяняецца (нулявы Дж.—Т. э.);



такая т-ра наз. пунктам інверсіі. Сукупнасць пунктаў інверсіі для пэўнага газу ўтварае крывую (гл. рыс.). Для стану газу з ціскам p і т-рай T унутры крывой Дж.—Т. э. дадатны, па-за ёю — адмоўны. Карыстаюцца Дж.—Т. э. для атрымання нізкіх тэмператур і звадкавання газаў.

ДЖУГАШВІЛІ Іосіф Вісарыёнавіч, гл. *Сталін* І. В.

ДЖУГДЖУР, горны хрыбет у межах Хабараўскага краю РСФСР. Цягнецца ўздоўж пэўн.-зах. ўзбярэжжа Ахоцкага м., ад вярхоўяў р. Учур да р. Улля на 500 *км*. Найвыш. пункт г. Топка (1906 *м*). Водападзел рэк бас. Алдана і Ахоцкага м. Складзены пераважна з дыябазаў і андэзітаў. Глыбока парэзаны. Усх. схілы стромкія, зах. пакатыя. Да выш. 1100 *м* укрыты тайгой.

ДЖУМАГУЛАЎ Эльмурза Біймурзаевіч (н. 16.11.1921, с. Карлан-Юрт Хасав'юртаўскага пав. Даг. АССР), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 24.6.1944 узвод танкаў на чале з Дж. фарсіраваў Друць на З ад Рагачова, перарэзаў шашу Рагачоў — Бабруйск, што намагло паспяховаму наступленню сав. войск на Бабруйск. Ганаровы грамадзянін Рагачова. Служыць у Сав. Арміі.

ДЖУМБАЕЎ Таймамат (н. 24.8.1924, г. Ош Ферганскай вобл. Туркестанскай АССР), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў кастр. 1943 у Гомельскай вобл. Аддзяленне Дж. фарсіравала Дняпро каля Лоева, захапіла варожыя траншэі, замацавалася на плацдарме і паспяхова адбіла контратакі. Служыць у Сав. Арміі.

ДЖУНГАРСКІ АЛАТАЎ, горная сістэма на У Казахскай ССР, на граніцы з Кітаем. Даўж. 450 *км*. Утварае некалькі паралельных ланцугоў, пераэзаных глыбокімі далінамі. Складзены з сланцаў, вапнякоў, пясчанікаў і вывергнутых парод. Найвыш. пункт г. Бесбаскан (4464 *м*). Ёсць ледавікі (агульная пл. 1120 *км*²).

Характэрны на розных вышынях платопадобныя прасторы — «сырты». З пэўн. схілу пачынаюцца рэкі Аксу, Каратал, Лепсы, якія выкарыстоўваюцца для арашэння. На ніжніх схілах гор пэўпустынная і стэпавая расліннасць, на верхніх — субальпійская і альпійская. На выш. 1200—2600 *м* на пэўн. схілах пояс леса-лугавой расліннасці.

ДЖУНКОЎСКАЯ-МАРКАВА Галіна Іванаўна (н. 6.10.1922, с. Юркаўка Тарашчанскага пав. Кіеўскай губ.), удзельніца баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1941. Лётчыца, штурман эскадрыллі. Вызначылася пры вызваленні Оршы і Барысава. Асабіста зрабіла 62 баявыя вылеты, знішчыла 3 склады боепрыпасаў, 2 эшалоны, 10 танкаў, 5 дзотаў, 30 аўтамашын і цягачоў; у групавых баях збіла 2 варожыя самалёты. Жыве ў Маскве.

ДЖЫЛЯРДЗІ Дз. І., рускі архітэктар, гл. *Жылярдзі* Дз. І.

«ДЖЭМІНІ», «Джэміні» (лац. Gemini — задыякальнае сузор'е Блізняты), назва серыі амерыканскіх двухмесных касмічных караблёў (КК), прызначаных для палётаў па калязямной арбіце; таксама назва праграмы іх распрацоўкі і палётаў.

КК «Дж.» складаецца з герметычнай капсулы, дзе размяшчаюцца 2 касманаўты, і негерметычнага адсека з абсталяваннем і тармазнымі рухавікамі, які аддзяляецца ад апарата пры спуску. Мае апаратуру і ракетны рухавік для збліжэння з інш. лятальнымі апаратамі на арбіце. Сістэма жыццезабеспячэння разлічана на 14 сутак, пасадка прадугледжана толькі на ваду. Першы палёт «Дж.-3» з касманаўтамі В. Грысамам і Дж. Янгам адбыўся 23.3.1965. «Дж.-4» запушчаны 3.6.1965 (касманаўты Дж. Макдывіт і Э. Уайт), у час палёту Э. Уайт выходзіў у космас на 20 *мін* (праз 2,5 месяца пасля першага ў гісторыі выхаду ў космас сав. касманаўта А. А. Лявонава). «Дж.-5» запушчаны 21.8.1965 (касманаўты Г. Купер і Ч. Конрад). «Дж.-7» — 4.12.1965 (касманаўты Ф. Борман і Дж. Ловел); у гэтым палёце адбылося збліжэнне з «Дж.-6» (касманаўты У. Шыра і Т. Стафард), запушчаным 15.12.1965. «Дж.-8» запушчаны 16.3.1966 (касманаўты Н. *Армстранг* і Д. Скот), у час палёту адбылася стыкоўка з выведзенай на арбіту ракетай «Аджана», пасля чаго КК страціў кіроўнасць і зрабіў аварыйную пасадку. «Дж.-9» запушчаны 3.6.1966 (касманаўты Т. Стафард і Ю. Сернан); у палёце адбылося збліжэнне на арбіце з штучным спадарожнікам Зямлі — спец. мішэнню «Атда». «Дж.-10» запушчаны 18.7.1966 (касманаўты Дж. Янг і М. *Колінз*), «Дж.-11» — 12.9.1966 (касманаўты Ч. Конрад і Р. Гордан), «Дж.-12» — 11.11.1966 (касманаўты Дж. Ловел і Э. *Олдрын*). У апошніх чатырох палётах касманаўты Ю. Сернан, М. Колінз, Р. Гордан і Э. Олдрын выходзілі ў касм. прастору; у трох апошніх палётах адбывалася стыкоўка КК з ракетай «Аджана». Запускам «Дж.-12» работы па праграме «Дж.» закончаны.

І. У. Косціна. Мінск.

ДЖЭМС (James) Уільям (11.1.1842—26.8.1910), амерыканскі псіхолаг і філосаф-ідэаліст, адзін з заснавальнікаў *прагматызму*. Адзінай рэчаіснасцю абвяшчаў дзейнасць і зместам чалавечай свядомасці, якую разумеў як паток непасрэдных адчуванняў і ўражанняў, што ўзнікаюць на аснове бесперапынных нервовых узбуджэнняў. Адмаўляў аб'ектыўную ісціну, лічыў ісцінным тое, што карыснае. У псіхалогіі Дж. праводзіў ідэі *валюнтарызму* і *біхевіярызму*.

Тв.: Рус. пер.— Научные основы психологии, СПб., 1902; Прагматизм, СПб., 1910.

Літ.: Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, с. 328 (Полн. собр. соч., т. 18, с. 363).

ДЖЭРОМ (Jerome) Джэром Клапка (2.5.1859, Уолсал, графства Стафардшыр — 14.6.1927), англійскі пісьменнік-гумарыст. Працаваў клеркам, настаўнікам, акцёрам. Першая кніга «На сцэне і за кулісамі» (1885). Быў рэдактарам гумарыст. час. «Idler» («Гультай») і «To-day» («Сёння»). Уражанні ад паездкі ў Расію (1889) у арт. «Рускія, якімі я іх ведаю». Аўтар апавяданняў («Бесклапотныя думкі гультая», 1886; «Як мы пісалі раман», 1893; і інш.), раманаў, аповесцей («Трое ў лодцы, не лічачы сабакі», 1889; і інш.), п'ес. У творах Дж. з жывым, дабрадушным гумарам паказана жыццё абывацеля.

Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, М., 1957.

ДЖЭРСЕЙСКАЯ парода буйной рагатай жывёлы, парода малочнага кірунку, выведзеная на в-ве Джэрсі (Вялікабрытанія). У выніку адбору па малочнасці і тлустасці малака атрыманы скараспелыя жывёлы з сярэднім надоем за год 3200—3500 *кг*, тлустасцю 5—6,5%, жывою масою 350—450 *кг*, бурай масцю розных адценняў. У СССР завозяць з 1948, у БССР з 1955. Быкоў выкарыстоўваюць у міжнародным скрыжаванні. На эксперым. базах «Зарэчча» Мінскай, «Вусце» Віцебскай і ў саўгасе «Леніна» Магілёўскай абл. створаны помесныя джэрсейскія статкі кароў, у малацэ якіх 4,2—4,8% тлушчу.



Літ.: Гл. пры арт. *Буйная рагатая жывёла. Г. М. Яхантава.* Жодзіна.

ДЖЭСПІЛІТ (англ. jasper яшма+грэч. lithos камень), *жалезісты кварцыт*, метамарфічная горная парода, у якой чаргуюцца тонкія (0,5—3 *мм*) прапласткі кварцыту і жалезнай руды. Змяшчае да 45% магнетыту, мартыту і гематыту.

У зонах выветрывання ад вылугоўвання паверхневымі водамі крамянзёму адбываецца другаснае абагачэнне Дж. жалезам. У вялікіх масах Дж. трапляецца ў дакембрыйскіх жалезарудных фармацыях. З Дж. звязаны вял. радовішчы жалеза (у СССР — Курская магн. анамалія, Крывы Рог; у ЗША — у раёне воз. Верхняга і інш.). На Беларусі джэспілітападобныя кварцыты знойдзены ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл.

Літ.: Точилин М. С. Происхождение железистых кварцитов, М., 1963.

ДЖЭФЕРСАН (Jefferson) Томас (13.4.1743, Албемарл — 4.7.1826), амерыканскі дзярж. і грамадскі дзеяч, асветнік, філосаф. З сям'і арыстакрата-землеўладальніка. У 1769 выбраны ў Заканадаўчы сход штата Віргінія. Адзін з ініцыятараў стварэння і член нелегальнага рэвалюц. Карэспандэнцкага к-та (узніклі ў перыяд падрыхтоўкі да вайны за незалежнасць у Паўн. Амерыцы 1775—83). У 1775 выбраны ў Кантынентальны кангрэс, які даручыў яму напісаць Дэкларацыю незалежнасці ЗША. Як член палаты прадстаўнікоў (1776—79) дамогся, каб былі прыняты законы, накіраваныя на выкараненне перажыткаў феад. права і землеўладання. На аснове напісанага Дж. «Статута аб рэліг. свабодзе» канстытуцыя ЗША 1787 зацвердзіла аддзяленне царквы ад дзяржавы. Вітаў бурж. рэвалюцыю ў Францыі. У гады, калі Дж. быў прэзідэнтам ЗША [1801—09], адменены рэакц. законы пра іншаземцаў, пра здраду і інш., зменшаны армія і дзярж. апарат, у 1808—09 устаноўлены дыпламат. адносіны з Расіяй. З 1809 адышоў ад паліт. дзейнасці. У 1797—1815 прэзідэнт Амер. філасофскага т-ва. Па яго ініцыятыве засн. Віргінскі ун-т. У аснове філас. поглядаў Дж. была тэорыя натуральнага права. Будучыню Амерыкі бачыў у развіцці земляробства і з гэтых пазіцый крытыкаваў капіталізм. Прагрэс. сілы ЗША карыстаюцца лепшымі традыцыямі Дж. ў барацьбе за мір і дэмакратыю.

Тв.: The papers. Ed. J. P. Boyd, v. 1—17, New York, 1953—1965; The essential Jefferson, New York, 1963.

Літ.: Ефимов А. В. США. Пути развития капитализма (доимпериалистическая эпоха), М., 1969; Аптекер Г. Американская революция. 1763—1783, пер. с англ., М., 1962 (гл. Паказальнік).

ДЗ, графема ў беларускім алфавіце. Дыграф, утвораны з літар «д» і «з». У помніках старабел. пісьменнасці абазначаў афрыкату «дз» у запазычаных словах. Як сродак паказу *дзекання* выступаў толькі спарадычна, звычайна афрыкату «дз» перадавалі літарай «д» («день», «дяковаць»). У сучаснай бел. мове абазначае афрыкату «дз» («дзынкаць», «надзённы», «сярэдзіна»).

ДЗАЦЭНІДЗЕ Георгій Самсонавіч [н.10(23).2.1910, Кутаісі], савецкі дзярж. і грамадскі дзеяч, вучоны-геолаг. Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета Груз. ССР. Акад. АН СССР (1968), АН Груз. ССР (1955). З сям'і. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Тбіліскі ун-т (1929). З 1933 заг. кафедры пед. ін-та ў Кутаісі, нач. геолагаразведвальнай партыі, дэкан, рэктар Тбіліскага ун-та. У 1951—55 в. а. акад.-сакратара, з 1955 першы віцэ-прэзідэнт АН Груз. ССР. З 1959 Старшыня Прэзідыума Вярх. Савета Груз. ССР, з 1960 нам. Старшыні Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Асн. працы па пытаннях палеавулканалогіі, літалогіі, сувязі магматызму з тэктонікай, уплыву вулканізму на літагенез. Адзін з стваральнікаў новага кірунку ў геалогіі вулканагенна-асадкавага літагенезу. На XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. Цэнтр. рэвіз. камісіі КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—8-га скл. Дзярж. прэмія СССР (1950). Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Тв.: Домиоценовый эффузивный вулканизм Грузии, Тбилиси, 1948; Влияние вулканизма на образование осадков, М., 1965; Роль вулканизма в образовании осадочных пород и руд, (2 изд.), М., 1969; В. И. Ленин и развитие науки и культуры в Советской Грузии, Тбилиси, 1970. *Т. З. Кікнадзе.* Тбілісі.

ДЗВІНА ЗАХОДНЯЯ, гл. *Заходняя Дзвіна*.

ДЗВІНАСА, рака, левы прыток Вілії (бас. Нёмана). Даўж. 54 *км*. Цячэ ў Лагойскім і Вілейскім р-нах Мінскай вобл. Вадазбор (614 *км*²) на ПнУ Беларускай грады, верхняя ч. ўзгорыстая, ніжняя раўнінная. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 4 *м*³/*сек*. Каля г. п. Плешчаніцы вадасховішча.

ДЗВІНСКАЯ ЛЯСНАЯ ДОСЛЕДНАЯ СТАНЦЫЯ Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі, навукова-даследчая ўстанова, якая распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні лясной гаспадаркі поўначы Беларусі. Засн. ў 1960 у г. п. Падсвілле Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Асн. праблематыка даследаванняў: фарміраванне высокапрадукцыйных насадак, стварэнне насенных плантацый хвоі і елкі, пытанні паляпшэння тэхналогіі лясных культур і вырошчвання насадачнага матэрыялу асн. лесаўтваральных парод. Дырэктар канд. с.-г. навук У. А. Марозаў (з 1965).

ДЗВІНСКІ КАНА́Л, левы прыток Лані (бас. Прыпяці). Даўж. 23 *км*. Знаходзіцца ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Вадазбор (74 *км*²) — плоская забалочаная аблесеная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,32 *м*³/*сек*. Выкарыст. пры меліярацыі.

ДЗЕВА (лац. Virgo), адно з 12 сузор'яў задыяка. Самая яркая зорка — Спіка (α Дз.), 1-й зорнай велічыні; разам з трыма менш яркімі ўтварае фігуру ромба, бачную простым вокам. У сузор'і выяўлена скопішча галактык спіральнай структуры. У Дз. знаходзіцца пункт асянення *раўнадзенства*. На тэр. БССР сузор'е відаць у канцы зімы і вясною. Гл. *Зорнае неба*.

ДЗЕВЕР, мужаў брат. Гл. *Роднасць і свайцтва*.

ДЗЕ́ВІНА, вёска ў Клюкаўскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Дзевінскае. Цэнтр калгаса імя Мічурына. За 27 *км* на Пн ад Оршы, 55 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Стайкі, каля шашы Орша — Віцебск (1 *км*). 165 ж., дварoў 48 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У 1944 нямфаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 28 жыхароў.

ДЗЕ́ВІНСКАЕ, возера ў бас. Лучосы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,94 *км*². Даўж. 5,1 *км*, найб. шыр. 0,7 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. 11 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Дно — падоўжная ўпадзіна, укрытая ілам; глыбіні паступова павялічваюцца да сярэдзіны. У паўп.-зах. ч. невялікі востраў. Вадазбор (40,7 *км*²) пераважна нізінны, укрыты лесам. З возера выцякае р. Серакаратнянка. Водзяцца лешч, шчупак, плотка, акунь.

ДЗЕВЯТАГА СТУДЗЕНЯ 1905 («*Крывавая нядзеля*»), дзень расстрэлу 9(22) студз. царскімі войскамі мірнай маніфестацыі пецярбургскіх рабочых, якія (больш за 150 тыс. чал.) ішлі да цара з петыцыяй.

Шэсце арганізавана па ініцыятыве свяшчэнніка Гапона з мэтай адарваць рабочых ад рэвалюц. выступленняў. Большавікі выступалі супраць шэсця. Яны растлумачвалі рабочым, што свабоды не прояшчэ верыў цару. Калі высветлілася, што маніфестацыя адбудзецца, большавікі выйшлі разам з працоўнымі, уключылі ў петыцыю с.-д. патрабаванні і працягвалі палiт. агітацыю. Мірная маніфестацыя была расстраляна. Забіта і параненa каля 4600 чал.

Злачынства царызму 9 студз. выклікала хвалю пратэсту працоўных па ўсёй краіне, у т. л. па Беларусі. Палескі і Паўн.-Зах. к-ты РСДРП, мясцовыя групы ў лістоўках тлумачылі палiт. сэнс пецярбургскіх падзей, заклікалі працоўных да барацьбы. У студз. 1905 стачкі адбыліся ў 66 гарадах Расіі; усяго ставала 444 тыс. рабочых, у т. л. ў Мінску, Гомелі, Магілёве, Полацку, Бабруйску і інш. гарадах і мястэчках Беларусі. Стачкамі былі адзначаны паўгоддзе і гадавіна «Крывавай нядзелі». «І вось іменна ў гэтым прабуджэнні каласальных народных мас да палітычнай свядомасці і да рэвалюцыйнай барацьбы і заключаецца гістарычнае значэнне 22 студзеня 1905 года» (Ленін У. І. Тв., т. 23, с. 229—230). Падзеі 9(22) студз. былі пачаткам *рэвалюцыі 1905—07 у Расіі*.

Літ.: Гл. пры арт. *Рэвалюцыя 1905—07 у Расіі*.

ДЗЕВЯТАЎ Аркадзь Сяргеевіч (н. 11.3.1923), Харанорскія капальні Чыцінскай вобл.), беларускі савецкі вучоны ў галіне пладаводства. Д-р с.-г. н. (1962), праф. (1965). Чл. КПСС з 1950. У 1946 скончыў Новасібірскі с.-г. ін-т. У 1953—57 заг. аддзела пладаводства Валгаградскай пладова-агародніннай доследна-селекцыйнай станцыі. З 1957 заг. аддзела агратэхнікі і механізацыі садоўніцтва Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы. Асн. працы па біялогіі пладовых раслін, іх глебавай экалогіі, па вывучэнні прышчэпаў яблыні, агратэхніцы, праектаванні і арганізацыі пладаводства. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Закладка плодового сада, Мн., 1960; Проектирование плодоводства, Мн., 1967; (у сааўт.) Плодовый сад, Мн., 1969.

ДЗЕВЯ́ТАЯ УСЕРАСІ́ЙСКАЯ КАНФЕРЭ́НЦЫЯ РКП(б), адбылася 22—25.9.1920 у Маскве. 116 дэлегатаў з рашаючым голасам і 125 з дарадчым ад 700 тыс. чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Даклад прадстаўніка польскіх камуністаў (У. Уляноўскі); 2) Паліт. справаздача ЦК (У. І. Ленін); 3) Арганіз. справаздача ЦК (М. М. Красіцінскі); 4) Аб чарговых задачах парт. буд-ва (Р. Я. Зіноўеў); 5) Даклад камісіі па вывучэнні гісторыі партыі (М. С. Альмінскі); 6) Справаздача аб II кангрэсе Камінтэрна (Р. Я. Зіноўеў).

Канферэнцыю адкрыў У. І. Ленін. У паліт. справаздачы гал. ўвагу ён аддаў заключэнню міру з Польшчай і мабілізацыі сіл для канчатковага разгрому Урангеля. Канферэнцыя адзначыла салідарнасць перадавых рабочых Польшчы з працоўнымі Краіны Саветаў; прызнала за неабходнае заключыць мір з Польшчай, ухваліла адрэдагаваную Леніным заяву ВЦВК пра ўмовы міру. Канферэнцыя ўхваліла паліт. лінію ЦК, адзначыла ўмацаванне парт. апарату за перыяд пасля IX з'езду РКП(б), абавязала сакратарыят ЦК больш знаёміцца з работай на месцах і выкарыстоўваць набыты вопыт у арганіз. буд-ве, узмацніць дзейнасць агіт.-прапаганд. аддзела. У рэзалюцыі «Аб чарговых задачах парт. будаўніцтва», праект якой напісаў Ленін, вызначаны меры развіцця ўнутрыпарт. дэмакратыі, умацавання адзінства партыі і яе сувязі з масамі, ажыўлення работы Саветаў, барацьбы з бюракратызмам, паляпшэння выхавання членаў партыі. Канферэнцыя патрабавала часцей праводзіць парт. сходы з абмеркаваннем найважнейшых пытанняў агульнапарт., агульнапаліт. і мясцовага жыцця; сістэматычна слухаць на агульных сходах справаздачы раённых, гарадскіх і губернскіх к-таў, дапускаць на адкрытыя парт. сходы беспартыйных, больш прымаць у партыю перадавых рабочых і сялян; сістэматычна перамяшчаць адказных работнікаў, вылучаць радавых членаў партыі на кіруючую работу, выпрацаваць меры для ліквідацыі няроўнасці паміж адказнымі работнікамі і «спецамі», з аднаго боку, і прац. масай — з другога, забараняла адказным работнікам — камуністам атрымліваць персанальныя стаўкі. Канферэнцыя дала адпор групе «дэмакратычнага цэнтралізму», якая выступала супраць кіруючай ролі партыі ў адносінах да сав., прафс. і гасп. арг-цый, адзінаначалля ў кіраўніцтве прамысловасцю, патрабавала дробнабурж. ураўнілаўкі ў аплаце працы. Каб узмацніць парт. кантроль, стварыла Цэнтр. кантрольную камісію.

Літ.: Ленін У. І. Прамова на IX Усерасійскай канферэнцыі РКП(б) 22 верасня 1920 г., Тв., т. 31 (Полн. собр. соч., т. 41); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954. *У. У. Зубец*.

ДЗЕВЯ́ТКІ, вёска ў Тэўлінскім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 23 *км* на ПнЗ ад Кобрына, 53 *км* ад Брэста, 5 *км* ад чыг. ст. Тэўлі. 230 ж., гасп. 77 (1971). Магазін. Помнік 37 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЕВЯ́ТНАЦЦАТЫ З'ЕЗД КП(б)Б, адбыўся 15—18.2.1949 у Мінску. 783 дэлегаты з рашаючым голасам і 129 з дарадчым ад 110 110 чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК КП(б)Б (М. І. Гусараў); 2) Справаздачны даклад Рэвіз. камісіі (В. Я. Слядых); 3) Выбары ЦК КП(б)Б; 4) Выбары Рэвіз. камісіі КП(б)Б.

З'езд ухваліў паліт. лінію і практ. дзейнасць ЦК. КП(б)Б правяла вялізную арганіз. і паліт. работу ў гады Айч. вайны: мабілізавала ў армію 1 млн. чал.; арганізавала эвакуацыю ў тыл краіны фабрык, з-даў, с.-г. тэхнікі, жывёлы, збожжа; на захопленай ворагам тэрыторыі разгарнула і ўзначаліла ўсенародную партыз. вайну. За пасляваенныя гады КП(б)Б выраслa на 84%, умацавалася ідэйна. З'езд падвёў вынікі работы КП(б)Б па аднаўленні і далейшым развіцці нар. гасп. БССР. У ходзе выканання 4-й пяцігодкі (1946—50) адноўлена асн. маса разбураных нямфаш. захопнікамі прамысл. прадпрыемстваў, стваралiся новыя галіны прамысловасці: аўтамабільная, трактарная, лакамабільная, дарожнага машынабудавання. На 1.1.1949 прамысловасць БССР па валавой прадукцыі дасягнула 65,8% даваеннага ўзроўню, магутнасць эл. станцый склала 150 тыс. *квт*, або 116,3% даваеннай, вытворчасць машынабуд. з-даў перасягнула даваенны ўзровень. Аднаўлялася с. гасп. У 1948 пасяўныя плошчы склалі 91,4%, пасевы бульбы 99,1, лёну 65,7% даваенных. Парт. арг-цыі зах. абласцей рэспублікі правялі вял. работу ў аднаўленні парадку землекарыстання, ліквідацыі беззямелля, прапагандзе калг. ладу. Павысіўся матэрыяльны дабрабыт і культ. ўзровень працоўных. Колькасць рабочых і служачых за 4 пасляваенныя гады павялічылася больш чым у 1,5, а фонд заработнай платы ў 2 разы. Выраслі грашовыя і натуральныя даходы калгаснікаў. Адноўлена даваенная сетка школ, тэатраў, б-к, хат-чытальняў. У гарадах і рабочых пас. пабудавана 2,9 млн. *м*² жылой плошчы, на вёсцы — 375 тыс. жылых дамоў, у якія пасялiліся 2 млн. чал. З'езд падкрэсліў, што найважнейшая задача КП(б)Б і ўсіх працоўных рэспублікі — датэрміновае выкананне 4-й пяцігодкі; намеціў мерапрыемствы па паляпшэнні парт. кіраўніцтва аднаўленнем і развіццём нар. гасп.

З'езд выбраў ЦК у складзе 83 чл. і 48 канд., Рэвіз. камісію ў складзе 29 чал. На пленуме 19.2.1949 выбрана Бюро ЦК КП(б)Б: чл. М. І. Гусараў, В. І. Закурдаеў, М. В. Зімянін, В. І. Казлоў, А. Я. Кляшчоў, У. А. Тамашэвіч, С. Г. Трафіменка, В. Я. Чарнышоў, Л. Ф. Цанава; канд. П. А. Абрасімаў, П. М. Брэнч, П. З. Калінін, П. М. Машэраў. Сакратарамі ЦК выбраны М. І. Гусараў, М. В. Зімянін, П. М. Брэнч, В. І. Закурдаеў, У. А. Тамашэвіч.

Літ.: Гусараў М. І. Справаздачны даклад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі на XIX з'ездзе КП(б)Б, Мн., 1949; Рэзалюцыя XIX з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі па справаздачы ЦК КП(б) Беларусі, Мн., 1949; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 437—441. *Р. Дз. Маюшэнка*. Мінск.

ДЗЕВЯТНАЦЦАТЫ З'ЕЗД КПСС, адбыўся 5—14.10.1952 у Маскве. 1192 дэлегаты з рашаючым голасам і 107 з дарадчым ад 6 013 259 чл. партыі і 868 886 канд. Прысутнічалі дэлегацыі 44 братніх камуністычных і рабочых партый. Нягледзячы на тое, што ў Вял. Айч. вайну загінула больш за 3 млн. камуністаў, колькасць членаў партыі з часу XVIII з'езду выраслa амаль у 3,8 раза.

Парадак дня: 1) Справаздачны даклад ЦК ВКП(б) (Г. М. Маленкаў); 2) Справаздачны даклад Цэнтр. рэвізійнай камісіі ВКП(б) (П. Г. Маскатаў); 3) Дырэктывы XIX з'езду партыі па 5-м пяцігадовым плане развіцця СССР на 1951—55 (М. З. Сабураў); 4) Змены ў Статуце ВКП(б) (М. С. Хрушчоў); 5) Выбары цэнтр. органаў партыі.

Усепераможная жыццёвая сіла палітыкі Камуніст. партыі пацвердзілася дасягненнямі сав. народа ў выкананні 3-га пяцігадовага плана і ўмацаванні абараназдольнасці краіны ў перадваенны перыяд, найвялікшай гістар. перамогай СССР у Вял. Айч. вайне, поспехамі ў гасп. і культ. буд-ве ў пасляваенныя гады. Сав. народ за кароткі час аднавіў разбураную гаспадарку рэспублік і абласцей, якія былі акупаваны гітлераўскімі захопнікамі, зрабіў новы крок наперад у пабудове камуніст. грамадства. Да канца 1952 валавая прадукцыя прамысловасці СССР выраслa ў параўнанні з 1940 на 225%, а прадукцыя маш.-буд. прамысловасці на 329%. У БССР маш.-буд. прадпрыемствы ў 1951 выдалі прадукцыі ў 14,7 раза больш, чым у 1940. Энерг. магутнасці БССР перавысілі даваенныя амаль у 2,5 раза. У развіцці нар. гасп. былі і недахопы. Асабліва цяжкае было становішча ў с. гасп. З'езд вызначыў задачы партыі і народа ў гасп. і культ. буд-ве. Ён прыняў дырэктывы па 5-м пяцігадовым плане развіцця СССР на 1951—55, у якіх прадугледжваўся магутны ўздым нар. гасп., далейшы рост дабрабыту і культ. ўзроўню народа. З'езд даў глыбокую характарыстыку расстаноўкі класавых сіл на сусв. арэне. З'езд прыняў пастанову аб змене назвы партыі Усесаюзная Камуністычная партыя (бальшавікоў) [ВКП(б)] на Камуністычная партыя Савецкага Саюза (КПСС). На з'ездзе зацверджаны Статут партыі. У яго новай рэдакцыі коратка вызначана сутнасць КПСС, сфармуляваны яе гал. задачы, унесены дадаткі і змены ў параграфы пра абавязкі і правы членаў партыі; зменена структура цэнтр. органаў партыі. Палітбюро

ЦК пераўтворана ў Прэзідыум ЦК, Камісія парт. кантролю рэарганізавана ў Камітэт парт. кантролю. З'езд прыняў рашэнне распрацаваць новую Праграму КПСС і стварыў для гэтага камісію.

З'езд выбраў ЦК КПСС у складзе 125 чл. і 111 канд. і Цэнтр. рэвізійную камісію ў складзе 37 чал.

Літ.: КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 3, Мн., 1954.
Ф. П. Шмыгаў. Мінск.

ДЗЕВЯТЫ З'ЕЗД КП(б)Б, адбыўся 8—12.12.1925 у Мінску. 247 дэлегатаў з рашаючым голасам і 161 з дарадчым ад 15 075 чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздача аб рабоце ЦК КП(б)Б (А. І. Крыніцкі); 2) Справаздача Рэвіз. камісіі (Дз. С. Чарнушэвіч); 3) Даклад ЦК РКП(б) (І. І. Скварцоў-Сяпанаў); 4) Даклад ЦКК РКП(б) (А. А. Сольц); 5) Справаздача ЦКК КП(б)Б (В. П. Грузель); 6) Аб гасп. буд-ве (Я. А. Адамовіч); 7) Аб рабоце прафсаюзаў (М. Е. Ендакоў); 8) Аб рабоце сярод моладзі (М. М. Галадзед); 9) Аб Чырв. Арміі (С. М. Кажэўнікаў); 10) Парт.-арганіз. пытанне; 11) Выбары.

З'езд ухваліў дзейнасць ЦК, ЦКК і рашэнні XIV канферэнцыі РКП(б); адобрыў паліт. лінію і арганіз. работу ЦК КП(б)Б. Адзначыў, што за справаздачны перыяд КП(б)Б умацавала свае рады, узмацніла работу на вёсцы — вакол парт. ячэек згрупавала бядняцка-сялянскі актыў, сав. і гасп. органы ўмацавала кваліфікаванымі кадрамі. З'езд падвёў вынікі аднаўлення прамысловасці і с. гасп. БССР. Прадукцыя цэнзавай прамысловасці, пасяўныя плошчы, ураджайнасць і валавая прадукцыя с. гасп. перавысілі даваенны ўзровень, павялічылася ўдзельная вага прамысловасці ў эканоміцы рэспублікі. Расшырыўся дзярж. і кааператыўны гандаль, палепшыўся дабрабыт працоўных. З'езд ухваліў тэзісы Палітбюро ЦК РКП(б) па гасп. буд-ве і падкрэсліў, што задачы, якія стаяць перад усёй партыяй, з'яўляюцца адначасова і задачамі КП(б)Б. Галоўная з іх — індустрыялізацыя рэспублікі, умацаванне прамысловасці як асновы сацыялізму, гаспадаркі і апоры дыктатуры пралетарыяту; далучэнне сялянства да сацыялізму. буд-ва шляхам яго кааперавання; забеспячэнне кіруючай ролі пралетарыяту ва ўсім гасп. буд-ве. Ухваліў тэзісы ЦК РКП(б) да XIV з'езду ВКП(б) і намеціў меры па іх практычным выкананні, абмеркаваў праект Статута РКП(б) і прапанаваў унесці ў яго асобныя змены і дадаткі. З'езд ухваліў новы адм.-тэр. падзел рэспублікі. Усе канферэнцыі, пачынаючы з VI Паўн.-Зах. абласной канфер. РКП(б), якая аб'явіла сябе *Першым з'ездам КП(б)Б*, рашыў шавікоў) Беларусі.

З'езд выбраў ЦК у складзе 43 чл. і 20 канд. Пленум 12.12.1925 выбраў Бюро ЦК КП(б)Б: чл. Я. А. Адамовіч, П. А. Барушка, М. М. Галадзед, С. М. Гесен, М. Е. Ендакоў, У. М. Ігнатоўскі, А. Я. Калнін, М. М. Карклін, А. І. Крыніцкі, Р. А. Пілляр, А. Р. Чарвякоў; канд. А. Р. Бейлін, У. А. Валынскі, Кавалерс, Ю. К. Румянцаў. Сакратарамі ЦК выбраны А. І. Крыніцкі, М. М. Галадзед.

Літ.: Резолюции и постановления IX съезда КП(б)Б, Мн., 1926; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 2, Мн., 1967, с. 75—76.
М. Я. Шкляр. Мінск.

ДЗЕВЯТЫ З'ЕЗД РКП(б), адбыўся 29.3—5.4.1920 у Маскве. 554 дэлегаты з рашаючым голасам і 162 з дарад. ад 611 978 чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздача ЦК (У. І. Ленін, М. М. Красціпскі); 2) Чарговыя задачы гасп. буд-ва (Л. Д. Троцкі, Н. Асінскі (В. В. Абаленскі), А. І. Рыкаў); 3) Прафесійны рух (М. І. Бухарын, Д. Б. Разанаў); 4) Задачы Камуніст. Інтэрнацыянала (К. Б. Радак); 5) Арганіз. пытанні (Л. Б. Каменеў, абмяркоўваліся на арганіз. секцыі з'езду); 6) Адносіны да кааперацыі (замест афіцыйнага дакладчыка М. М. Красціпскага, які на пасяджэнні кааператыўнай секцыі атрымаў меншасць галасоў, выступіў У. П. Мілюцін); 7) Пераход да міліцыйнай сістэмы (Л. Д. Троцкі); 8) Выбары ЦК; 9) Бягучыя справы.

Работай з'езду кіраваў У. І. Ленін. Ён выступіў з паліт. справаздачай ЦК і з заключным словам па дакладзе, з прамовамі па гасп. буд-ва, кааперацыю, пры выбарах ЦК, адкрыцці і закрыцці з'езду. У паліт. справаздачы У. І. Ленін падагуліў вопыт дзейнасці Сав. дзяржавы, асвятліў міжнар. і ўнутр. становішча краіны, знешнюю палітыку РКП(б), вызначыў задачы партыі па сацыяліст. буд-ве ва ўмовах мірнай перадышкі. Ён заклікаў працоўных прыкласці максімум намаганняў для аднаўлення нар. гасп., падкрэсліў выключнае значэнне адзінага гасп. плана, у аснове якога павінна быць электрыфікацыя краіны. З'езд ухваліў дзейнасць ЦК. Галоўным у рабоце з'езду было пытанне пра гасп. буд-ва. У рэзалюцыі «Аб чарговых задачах гасп. буд-ва» з'езд канстатаваў некаторы працоўны ўздым, падкрэсліў, што гал. ўмова гасп. адраджэння краіны — няўхільнае ажыццяўленне адзінага гасп. плана, які прадугледжваў палепшыць стан транспарту, зрабіць запасы хлеба, паліва, сыравіны, развіваць машынабудаванне. Гал. месца ў плане адводзілася электрыфікацыі нар. гасп., якую Ленін ставіў як найвялікшую праграму на 10—20 гадоў. Дырэктывы з'езду пакладзены ў аснову плана ГОЭЛРО. Для вырашэння гасп. задач з'езд прапанаваў прыцягнуць увесь індустр. пралетарыят, арганізаваць масавыя мабілізацыі па прац. павіннасці, часова выкарыстаць у якасці працоўных армій вайск. часці, разгарнуць спаборніцтва як важны сродак павышэння прадукцыйнасці працы. У пытаннях арганізацыі кіравання гаспадаркай з'езд узяў курс на адзінаначалле, адхіліў прапановы групы «дэмакратычнага цэнтралізму», якая патрабавала неабмежаванай калегіяльнасці. Вызначыў узаемаадносіны прафсаюзаў з дзяржавай і партыяй, іх ролю, формы і метады работы, падкрэсліў неабходнасць актыўнага ўдзелу прафсаюзаў у аднаўленні нар. гасп., паляпшэння парт. кіраўніцтва прафсаюзамі; звярнуў увагу на развіццё спажывецкай, с.-г. і промыславай кааперацыі, прапанаваў умацаваць парт. кіраўніцтва ў кааператыўных органах. З'езд патрабаваў сканцэнтраваць увагу РКП(б) і ўсіх яе арг-цый на пытаннях гасп. буд-ва, нацэліў партыю, рабочы клас, усіх працоўных на барацьбу з эканам. разрухай, на аднаўленне нар. гаспадаркі.

Літ.: Ленін У. І. [IX з'езд РКП(б). 29 сакавіка — 5 красавіка 1920 г.], Тв., т. 30 (Полн. собр. соч., т. 40); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954; Девятый съезд РКП(б). Март — апрель 1920 г. Протоколы, М., 1960.
Л. І. Валаховіч. Мінск.

ДЗЕВЯТЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, адбыўся ў Мінску 8—15.5.1929. Прысутнічала 653 дэлегаты з рашаючым голасам і 209 з дарадчым; з іх 443 (70,2%) чл. і канд. ў чл. КП(б)Б.

Парадак дня: 1) Справаздача Урада БССР (М. М. Галадзед); 2) Даклад СНК БССР аб пяцігадовым плане развіцця нар. гасп. і культуры БССР: а) агульны даклад (М. М. Карклін), б) 5-гадовы план развіцця прамысловасці (С. В. Крап), в) 5-гадовы план развіцця культуры (А. В. Баліцкі); 3) Даклад камандуючага БВА аб Чырв. Арміі (А. І. Ягораў); 4) Выбары ЦВК БССР; 5) Выбары ад БССР членаў Савета Нацыянальнасцей ЦВК СССР.

З'езд ухваліў дзейнасць Урада БССР па сацыяліст. развіцці рэспублікі. Канстатаваў дасягненні БССР у індустрыялізацыі (расшырэнне прамысл. буд-ва, тэхн. рэканструкцыя прадпрыемстваў, павелічэнне ўдзельнай вагі прамысловасці ў нар. гасп., павышэнне прадукцыйнасці працы); у рэканструкцыі с. гасп. (капіталаўкладанні ў 1928—29 падвоены ў параўнанні з 1926—27, павялічылася колькасць калгасаў і с.-г. аб'яднанняў, расшыраны пасяўныя плошчы, асабліва пад тэхн. культурамі, вырасла ўраджайнасць); у павышэнні культ. ўзроўню насельніцтва (рост школ, разгортванне прафес.-тэхн. адукацыі, навук.-даследчай працы — адкрыты НДІ прамысловасці і НДІ працы, Ін-т бел. культуры рэарганізаваны ў АН БССР); ухваліў мерапрыемствы па рацыяналізацыі і скарачэнні дзярж. апарату. З'езд зацвердзіў першы 5-гадовы план развіцця нар. гасп. і культуры БССР на 1928/29—1932/33. Прыняў пастанову, накіраваную на далейшае ўмацаванне баяздольнасці часцей БВА.

На з'ездзе выбраны ЦВК БССР у складзе 254 чл. і 88 канд.; у Савет Нацыянальнасцей ЦВК СССР выбраны ад БССР 5 чл. і 2 канд. Старшынёй ЦВК БССР выбраны А. Р. Чарвякоў, старшынёй СНК БССР М. М. Галадзед.

Літ.: Дзевяты Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Стэнаграфічная справаздача, Мн., 1929; Пастановы IX Усебеларускага з'езду Саветаў і I сесіі ЦВК БССР IX склікання, Мн., 1929.
В. С. Паваліхіна. Мінск.

ДЗЕВЯТЫ УСЕРАСІЙСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ рабочых, сялянскіх, чырвонаармейскіх і працоўных казацкіх дэпутатаў РСФСР, адбыўся 23—28.12.1921 у Маскве. Прысутнічаў 1991 дэлегат, у т. л. 1631 з рашаючым голасам, з іх 1522 чл. і канд. ў чл. РКП(б); рабочых 39%, сялян 20, служачых 32,5, інш. 8,5%. Ад БССР на з'ездзе быў 21 дэлегат з рашаючым голасам і 2 з дарадчым; ад Гомельскай губ. 31 дэлегат з рашаючым голасам і 2 з дарадчым; ад Віцебскай губ. 17 дэлегатаў з рашаючым голасам.

Парадак дня: справаздача ВЦВК і СНК аб знешняй і ўнутр. палітыцы рэспублікі (У. І. Ленін); дакладчыкі: аб дапамозе галодным (М. І. Калінін), аб папярэдніх выніках новай эканам. палітыкі (Л. Б. Каменеў), аб становішчы прамысловасці (П. А. Багданаў), аб аднаўленні с. гасп. [Н. Асінскі (В. В. Абаленскі), садакладчык Н. М. Тулайкоў], аб кааперацыі (Л. М. Хінчук), аб фінансах і бюджэце (М. М. Красціпскі), аб буд-ве Чырв. Арміі (Л. Д. Троцкі), аб савецкім буд-ве (Ц. У. Сапронаў), выбары ВЦВК. З'езд таксама разгледзеў пытанне пра электрыфікацыю дзяржавы (Г. М. Крыжаноўскі).

У справаздачы У. І. Ленін адзначыў, што дасягнута пэўная, хоць і няўстойлівая, раўнавага ў міжнар. адносінах, падкрэсліў неабходнасць далейшага ўмацавання эканам. саюзу рабочых і сялян на аснове нэпа. З'езд ухваліў знешнюю і ўнутр. палітыку Сав. ўрада, падвёў вынікі нэпа за 10 мес. і прызнаў першачарговай задачай уздым с. гасп. З'езд даў права зямельным т-вам свабодна выбіраць формы землекарыстання: кааператыўную, абшчынную, водрубную, хутарскую ці мяшаную, заклікаў органы Сав. улады садзейнічаць кааператыўнаму сялян, зацвердзіў дэкрэт СНК «Аб электрыфікацыі», прыняў распрацаваны У. І. Леніным «Наказ аб гаспадарчай рабоце», ухваліў скарачэнне ўзбр. сіл рэспублікі ў 3 разы і намеціў мерапрыемствы па ўмацаванні арміі і паляпшэнні яе баяздольнасці. У дэкларацыі аб міжнар. становішчы РСФСР ухваліў мерапрыемствы Сав. дзяржавы на ўстанаўленне і ўмацаванне мірных адносін з суседнімі дзяржавамі. Выпрацаваў меры барацьбы з голадам, выказаў удзячнасць рабочым усіх краін, якія памагалі галодным Паволжа, адзначыў заслугі ў гэтым нарвежскага палярнага даследчыка Ф. Нансена. З'езд выбраў ВЦВК у складзе 386 чл. і 127 кандыдатаў.

Літ.: Девятый Всероссийский съезд Советов рабочих, крестьянских, красноармейских и казачьих депутатов. Стенографический отчет, М., 1922.
М. Я. Стральцоў. Мінск.

ДЗЕГЦЯРЫ, вёска ў Васілішкаўскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Лябёдка. Цэнтр калгаса «Уперад». За 37 *км* на ПнУ ад Шчучына, 90 *км* ад Гродна, 22 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 118 ж., гасп. 43 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ДЗЕД, 1) бацька маці або бацькі. 2) Персанаж славянскай міфалогіі, бог, які лічыцца родапачынальнікам сям'і і ахоўнікам дому. 3) Да канца 19 ст. Дз. наз. прыстасаванне для лучыны, якая асвятляла хату бел. селяніна (расшчэпленая жэрдка, прымацаваная да калоды ці крыжавіны). 4) Дз. наз. таксама шост у рыбалоўных прыладах (крызе, волаку).

ДЗЕДЗІК Павел Іванавіч [н. 15(28).3.1901, в. Свірыдавічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сял. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КПБ (1955). У 1927—41 на сав., парт. і журналісцкай рабоце ў Жыткавіцкім, Кармянскім і Чачэрскім р-нах. У партызанах з 1941: камісар атрада, *партызанскай брыгады 1-й Гомельскай*, адначасова сакратар Чачэрскага падпольнага РК КП(б)Б. У 1943—65 на парт. рабоце ў Чачэрскім, Гомельскім р-нах, у Гомельскім абкоме КПБ. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Гомелі.

ДЗЕДЗІНА, вёска ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Набіста. Цэнтр сельсавета і калгаса «За ўладу Саветаў». За 16 *км* на ПнЗ ад Міёраў, 206 *км* ад Віцебска, 18 *км*

ад чыг. ст. Міёры. 115 ж., гасп. 44 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік 16 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЕЕПРЫМЕ́ТНІК, дзеслоўная форма з асабліваснымі дзеяслова і прыметніка. Абасабліваснымі дзеяслова і прыметніка. Абасабліваснымі дзеяслова і прыметніка. Абас

калгаса імя XXI з'езду КПСС гэтага ж р-на. Узнаг. ордэнам Кастр. Рэвалюцыі.

ДЗЕМІДОВІЧ Іван Францавіч (н. 25.9.1930, г. Барысаў), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1970). Чл. КПСС з 1960. Скончыў Ленінградскі завочны індустр. ін-т (1957). З 1949 на Мінскім аўтамаб. з-дзе, з 1969 нам. гал. канструктара. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за стварэнне канструкцыі уніфікаванай сям'і высокапрадукцыйных вялікагрузных транспартных аўтамабіляў, аўтапаяздоў і аўтасамазвалаў МАЗ-500 і арг-цыю іх выпуску на Мінскім аўтамаб. з-дзе.

ДЗЕМІДОВІЧ Павел Пятровіч (г. н. і см. невяд.), беларускі краязнавец, этнограф і фальклярыст 19—1-й пал. 20 ст. Працаваў настаўнікам гар. вучылішчаў Мінскай і Віленскай губ., у Мінску (20-я г.). Вывучаў сямейны побыт, вераванні і абрады беларусаў, запісваў фальклор. Большасць сабраных матэрыялаў перадаваў М. В. *Доўнар-Запольскаму*. Зборы бел. *гутаркі* (апубл. «Гутарку Паўлюка» ў газ. «Виленский вестник», 1898, № 173).

Тв.: Рождественские святки, «Виленский вестник», 1894, № 277, 281, 1895, № 3; Мелкие заметки из жизни белорусов, там жа, 1895, № 62, 64, 67; Благовещение, там жа, 1895, № 68; Пасха у сельчан белорусов, там жа, 1895, № 73—74; Радуница в Белоруссии, там жа, 1895, № 77; Купала в белорусской деревне, там жа, 1895, № 134; Из области верований и сказаний белорусов, «Этнографическое обозрение», 1896, № 1, 2—3; Белорусские детские игры, «Живая старина», 1898, в. 3—4.

ДЗЕМІЧАЎ Пётр Нілавіч [н. 21.12.1917(3.1. 1918), пас. Пясочня Калужскай губ.], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. З рабочых. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т імя Мендзялеева (1944), ВПШ пры ЦК КПСС (1953). У 1937—44 у Чырв. Арміі, потым заг. аддзела, сакратар Савецкага райкома ВКП(б) Масквы; у 1950—56 у Маскоўскім гаркоме, абкоме партыі і ў ЦК КПСС; у 1956—58 сакратар МК КПСС. У 1958 кіраўнік спраў Савета Міністраў СССР. У 1959—62 першы сакратар Маскоўскага абкома, гаркома партыі. З кастр. 1961 сакратар ЦК КПСС. На XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. У 1959—61 чл. Бюро ЦК КПСС па РСФСР, у 1964 — крас. 1966 канд. у чл. Прэзідыума ЦК КПСС; з крас. 1966 канд. у чл. Палітбюро ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 5—8-га скл.; у 1962—66 чл. Прэзідыума Вярх. Савета СССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



ДЗЕМЯНЕЎ Мікалай Васілевіч [н. 29.11 (12.12).1902, пас. Чэрмоз Пермскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне фізічнай хіміі. Акад. АН Кірг. ССР (1961), д-р тэхн. н., праф. (1948). Чл. КПСС з 1919. Старшыня Уральскага філіяла АН СССР (Свярдлоўск, 1957—61). Заг. кафедры хіміі Бел. ін-та нар. гасп. імя Куйбышава (з 1965). Навук. працы па хім. тэхналогіі і металургіі рэдкіх элементаў (тытану, ніобію, танталу і інш.). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Поверхностные воли и гели металлов, Свердловск, 1948; у кн.: Труды Ин-та химии Уральского филиала АН СССР, в. 7, Свердловск, 1963.

ДЗЕМЯНКОЎ Віктар Андрэевіч (н. 7.6.1927, Магілёў), перадавік чыг. транспарту, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1955. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. У 1944—55 слесар, качагар, нам. машыніста, машыніст паравознага дэпо ст. Магілёў. У 1957—65 машыніст, з 1965 машыніст-інструктар лакаматыўнага дэпо ст. Магілёў Беларускай чыг. Дэп. Вярх. Савета БССР 8-га скл. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

ДЗЕМЯНКОЎ Лаўрын Васілевіч (н. 15.7. 1918, в. Сакалоўка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1938. У Айч. вайну з снеж. 1941 на Ленінградскім і Карэльскім франтах — камандзір узвода і роты. Вызначыўся 21.6.1944 пры фарсіраванні р. Свір і прарыве варожай абароны каля г. Ладзейнае Поле Ленінградскай вобл. Заглушыў супрацьпяленне 2 варожых дзотаў. 23.6.1944 тройчы на чале ўзвода штурмаваў ням. траншэі. Ранены не пакінуў поля бою. Жыве ў Варонежы.



ДЗЕМЯХІ, вёска ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл., каля р. Ведрыч. Цэнтр сельсавета. За 14 *км* на З ад Рэчыцы, 58 *км* ад Гомеля, 1 *км* ад чыг. ст. Дземяхі, на шашы, якая злучае вёску з Рэчыцай. 500 ж., гасп. 189 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Адам Станіслававіч [19.10 (1.11).1902, Орша — 12.9.1961], генерал-лейтэнант авіяцыі (1959). З рабочых. Член КПСС з 1926. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У Чырв. Арміі з 1920. У Айч. вайну на Зах., 1-м Бел. франтах: нач. штаба дывізіі, ВПС арміі, корпуса. Удзельнік абароны Масквы, Ленінграда, вызвалення Польшчы, баёў за Берлін. З 1945 нач. штаба злучэнняў, нам. нач. Ваен.-паветр. акадэміі. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі, 2 ордэнамі ПНР.



ДЗЕНГА (тат. цэнга — манета), руская срэбраная, потым медная манета 14—18 ст. Пачала чаканіцца ў 2-й пал. 14 ст. ў Маскве, у пач. 15 ст.— у іншых рус. княствах (у Ноўгарадзе з 1420).

Першапачатковая маса 0,92 *г*, складала $^1/_{100}$ маскоўскага лікавага рубля або $^1/_{216}$ наўгародскага. Некат. княствы выпускалі $^1/_2$ Дз. (палушку), а Ноўгарад і Пскоў $^1/_4$ Дз. (чацвярцец). Паводле грашовай рэформы 1534 уведзена наўгародская Дз. (наўгародка) масаю 0,68 *г*, пазней наз. капейкай дзенгай, або капейкай, бо на ёй быў малюнак коніка з кап'ём. Маскоўская Дз. (маскоўка) масаю 0,34 *г* называлася Дз., або Дз.-шабляніцай, на ёй быў малюнак коніка з шаблю. $^1/_2$ Дз. (палушка) адпавядала палове маскоўскай Дз. і чвэрці капейкі. З канца 16 ст. эмісія Дз.-шабляніцы мела спарадычны характар. У сярэдзіне 17 ст. і з пач. 18 ст. чаканіліся медныя Дз., з канца 18 ст. на манетах сталі пісаць слова «дзеньга». У 1849—67 Дз. называліся дзесяцікамі, потым $^1/_2$ капейкі. На тэр. Беларусі Дз. былі ў абарачэнні з 80-х г. 16 ст.

Літ.: Орешников А. В. Русские монеты до 1547 года, М., 1896 (Описание памятников Российского ист. музея, в. 1); Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970; Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968.

В. И. Рабцэвіч. Мінск.

ДЗЕНІСЁНА ЖОЎТАЯ, сорт чарэшні. Паходжанне дакладна не вызначана. На Беларусі пашыраны ў цэнтральных і паўднёвых раёнах.

Дрэвы высокія (5—6 *м*), крона густая. Плады важаць 4—5 *г*, паспяваюць у 2-й пал. ліпеня. Скурка тонкая, светла-жоўтая. Мякаць сакавітая, салодкая. Сорт зімастойкі, урадлівы (у 10 гадоў дрэва дае да 30 *кг* пладоў), устойлівы да грыбных хвароб. Пладаносіць на 3—4-ы год. Найлепшыя апыляльнікі: *Пайночная*, Драгана жоўтая. Іл. гл. ст. да арт. *Чарэшня*.

ДЗЕНІСЁНКА Дамітрый Анісімавіч [н. 9(22).3.1917, станіца Пластуноўская Кубанскай вобл.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1945. У Чырв. Арміі з 1940. У партызанах з мая 1942 — камандзір атрада, са студз. 1944 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Беларускай кавалерыйскай* Баранавіцкай вобл. Пасля вайны на сав. рабоце ў Брэсцкай і Гродзенскай абл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. п. Любча Гродзенскай вобл.

ДЗЕНІСЁНКА Тамара Ягораўна (н. 9.1.1931, в. Бель Дубровенскага р-на), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). У 1949—59 калгасніца калгаса «Зорка»; у 1959—64 палявод, з 1964 даярка саўгаса «Арловічы» Дубровенскага р-на Віцебскай вобл.

ДЗЕНІСКЕВІЧ Мікалай Міхайлавіч [26.4 (9.5).1904, в. Закаблукі Мінскага пав.— 29.10. 1937], савецкі парт. дзеяч. З рабочых. Чл. КПСС з 1921. Скончыў Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП(б) (1930). У 1918 слесар дэпо чыг. ст. Мінск. З 1921 сакратар Кастрычніцкага райкома камсамола Мінска, з 1924 сакратар Аршанскага акруговага к-та камсамола, з 1930 заг. аддзела ЦК КП(б)Б. У 1934—37 першы сакратар Лёзненскага райкома, сакратар Віцебскага гаркома КП(б)Б. З чэрв. 1937 другі сакратар ЦК КП(б)Б. На XV з'ездзе КП(б)Б выбіраўся чл. ЦК, на XVI чл. Бюро ЦК КП(б)Б.

«ДЗЕННІК МІНЬСКІ» («Dziennik Mińskі»), бурж.-нацыяналістычная газета, якая выдавалася ў Мінску з жн. 1917 — да ліст. 1918 на польскай мове памешчыцкай арг-цыяй, т. зв. Польскай радай мінскай зямлі. Выступала супраць Сав. улады і нацыянальных інтарэсаў беларусаў.


Літ.: Bilas A. Prasa polska w Rosji w dobie wojny i rewolucji (1915—1919), Warszawa, 1968.

ДЗЕНІШЧЫКОЎ Пётр Іосіфавіч (н. 15.2. 1918, Цюмень), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1948. Удзе... ...ік Аб. г. вайны. У 1947—51 старшыня Індурскага с/с, з 1951 старшыня калгаса «Авангард» Гродзенскага р-на. Дэп. Вярх. Савета СССР 8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

ДЗЕНЬ ПАРТЫЗАНА, народная ўрачыстасць, прысвечаная гераічнай барацьбе сав. людзей з ням.-фаш. захопнікамі, памяці партызанаў і воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. На Беларусі бытуе з першых пасляваенных гадоў. Адзначаецца кожны год у чэрв.— ліп. на месцах былых партыз. стаянак і баявых дзеянняў. Пачынаецца мітынгам — перад жыхарамі выступаюць героі Айч. вайны, прадстаўнікі грамадскасці, былыя партызаны і воіны. На магілы партызанаў і воінаў усклад-аюць вянкі і кветкі. Да Д. п. часта прымяркоўваюць адкрыццё помнікаў тым, хто загінуў у барацьбе з фашызмам.

ДЗЕРАВЯШКІ (*дзеравяннікі, трэпы*), абутак на драўлянай падэшве. Насілі Дз. на Віцебшчыне і Гродзеншчыне. У літоўцаў падобны абутак звaўся клумпес, у французаў — сабо.

ДЗЕРАЗА (Lycopodium), род вечназялёных споравых травяністых раслін сям. дзеразовых. Вядома каля 400 відаў, пашыраных на ўсім зямным шары. У СССР 17 відаў, на Беларусі 6. Дз. баранец і Дз. плаская-сціснутая выкарыстоўваюцца як фарбавальныя расліны (даюць жоўтую і зялёную фарбы). Шмат відаў, пераважна трапічных, выкарыстоўваецца ў дэкар. кветкаводстве.



Дзераза булавападобная: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — спарафіл (ліст); *3* — споры.

Сцябло паўзучае, даўж. 5—150 см, з дробным ланцэтным лісцем. У канцы лета паўляюцца дробныя жоўтыя споры. На Беларусі найб. вядомая Дз. булавападобная (L. clavatum, нар. назвы: дзеругá, бабін мур, варанец, цикун, вілак, дзяруаа). Расце ў хвойных і мяшаных лясах. Споры выкарыстоўваюцца ў медыцыне.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны*.

ДЗЕРАЎНАЯ, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Іса. Цэнтр сельсавета і калгаса «Уперад». За 15 *км* на ПнУ ад Слоніма, 180 *км* ад Гродна. Аўтобусная ст. на шашы Слонім — в. Моўчадзь. 799 ж., гасп. 253 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 4 магазіны. Помнік аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЕРАЎНАЯ, вёска ў Хатаўскім с/с Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоная зорка». За 28 км на ПнЗ ад Стоўбцаў, 106 км ад Мінска, на аўтамаб. дарозе Стоўбцы — Івянец. 938 ж., гасп. 255 (1971). Пякарня, млын, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 5 магазінаў. 2.6.1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 12 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЕРАЎЦЫ, чыг. ст. на лініі Асіповічы — Баранавічы, вёска ў Пратасевіцкім с/с Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Сінька (2 км). За 9 км на ПдЗ ад Асіповіч, 145 км ад Магілёва. 148 ж., гасп. 61 (1971). Васьмігадовая школа, аддз. сувязі.

ДЗЯРБАН Мікалай Лявонавіч [н. 2(15).5.1907, в. Локаць Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1929. У Чырв. Арміі з 1929. Удзельнік абароны Мінска 1941. У партызанах з крас. 1942 — камандзір узвода, атрада, з кастр. камандзір *партызанскай брыгады імя М. А. Шчорса* Мінскай вобл. Пасля вайны на сав. рабоце ў Гродзенскай вобл., у 1947—65 у Мінскай і Віцебскай абл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў г. п. Бягомль Віцебскай вобл.

ДЗЯРБАН Уладзімір Міхайлавіч [н. 30.7(12.8).1910, в. Локаць Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. У 1934—41 у органах НКУС у Жыткавіцкім р-не. У партызанах з ліп. 1941 — камандзір, камісар атрада, з кастр. 1943 камісар *партызанскай брыгады 50-й Жыткавіцкай* Палескай вобл. З ліп. 1944 сакратар Іванавіцкага РК КП(б)Б Брэсцкай вобл., у 1948—55 пракурор Чэрвеньскай міжраённай пракуратуры Мінскай вобл. З 1961 у пракуратуры, потым у юрыд. кансультацыі Жлобіна. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ДЗЯРБІН, вёска ў Валосавіцкім с/с Акцябрскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя М. Горкага. За 25 км на ПдУ ад Акцябрскага, 182 км ад Гомеля, 28 км ад чыг. ст. Рабкор. 197 ж., гасп. 58 (1971). Пач. школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 25.6.1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 283 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 237 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДЗЯРБІЧЫ, вёска ў Рагінскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл., на р. Чачора. Цэнтр саўгаса «Дзярбічы». За 22 км на ПнУ ад Буда-Кашалёва, 57 км ад Гомеля, на шашы Ленінград — Адэса. 691 ж., гасп. 182 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЗЯРБНІК (Falco columbarius), драпежная птушка сям. сакаліных. Пашыраны ў Еўропе, Паўн. Амерыцы і Паўн. Азіі. На Беларусі (нар. назва галубятнік) гняздуецца ў паўн. частцы, на пралёце трапляецца ўсюды.

Даўж. цела Дз. 276—336 мм, маса 160—228 г. Апярэнне на спіне шызавата-шэрае, знізу брудна-вата-рыжаватае з падоўжнымі цёмнымі плямкамі. Гняздо робіць на дрэвах, нярэдка займае чужое. Нясе 3—4 яйцы. Корміцца пераважна дробнымі птушкамі (шпакамі, вераб'ямі, ластаўкамі).

Літ.: Птицы Советского Союза, т. 1, М., 1951; Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ДЗЯРВАЕД Вольга Сямёнаўна (н. 17.7.1923, в. Межава Аршанскага пав. Віцебскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1963. Прац. дзейнасць пачала ў саўгасе «Межава» Аршанскага р-на Віцебскай вобл. У 1944—70 далрка эксперым. базы «Межава» абласной с.-г. доследнай станцыі (да 1947 саўгас «Межава»). Дэлегат XXIII з'езду КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга. Жыве на радзіме.

ДЗЯРКАЎШЧЫНА 1-я, вёска ў Тумашаўскім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Герой працы». За 15 км на ПдЗ ад Глыбокага, 215 км ад Віцебска. 238 ж., гасп. 68 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 36 сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЗЯРНУШКОЎ Феафан Ігнатавіч [н. 28.9(11.10).1914, в. Краснае Сяло Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1948), Вышэйшую парт. школу пры ЦК КПСС (1961). У 1933—41 на сав. і камсамольскай рабоце. З мая 1942 у тыле ворага — нам. камісара партыз. брыгады, сакратар падпольнага Бягомльскага РК ЛКСМБ. З кастр. 1943 камісар *партызанскай брыгады «Жалязняк»* Мінскай вобл., адначасова сакратар Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б. У 1944—59 на парт. рабоце ў Мінскай вобл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Барысаве.

ДЗЯРУЖЫНСКІ Аляр'ян Сафонавіч (н. 10.6.1919, в. Хляўно Быхаўскага пав. Гомельскай губ.), беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1949. З сялян. Скончыў Камуніст. ін-т журналістыкі ў Мінску (1941). У Айч. вайну карэспандэнт і супрацоўнік газет у Краснаярскім краі, Калінінскай вобл., Маскве. З 1949 рэдактар выд-ва «Беларусь». Літ. дзейнасць пачаў у 1942. Першы зб. вершаў «Песні маладосці» (1959). На тэксты Дз. напісаны песні «Мінскі вальс», «Мяцеліца», «Залатыя каласы», «Незадаровіцца», «Беларусь» і інш.

Тв.: Цуды ёсць на свеце, Мн., 1960; Калінавы цвет, Мн., 1961; Дзе жыве зіма, Мн., 1962; Карагод, Мн., 1963; Ляцелі дзве птушкі, Мн., 1964; Яе звануць Каця, Мн., 1965; Кую-кую ножку, Мн., 1967; Смешкі і пацешкі, Мн., 1968; Добры ветрык, Мн., 1969; Чабарок, Мн., 1970.

ДЗЯРУНОЎ Канстанцін Мікалаевіч [1(13).6.1866—29.7.1929], савецкі бібліятэказнавец і бібліёграф. За ўдзел у народніцкім рэвалюц. руху выключаны з Пецярбургскага ун-та і высланы. Пасля Кастр. рэвалюцыі заг. б-кі Расійскай асацыяцыі НДІ грамадскіх навук. Самая вялікая праца Дз.— бібліяграфія рускіх рэцэнзій (за 1850—1928) у 325 рус. перыядычных выданнях.

Тв.: Примерный библиотечный каталог. Избранная литература по всем отраслям знания. С приложением сводного указателя журнальных рецензий на книги за период 1847—1907 гг., ч. 1—2, 2 изд., СПб., 1908—11; Жизненные задачи библиографии, М., 1913; Типичные черты в эволюции русской «общественной» библиотеки, М., 1924; Библиография русских рецензий (1850—1924), Орел, 1924; Типичные черты в эволюции русских центральных государственных книгохранилищ, М., 1926.

Літ.: Бодиарский В. Памяти К. Н. Дерунова, «Библиографические известия», 1929, № 1—2; Кирпичева И. К., К. Н. Дерунов (1866—1929). Очерк жизни и деятельности, М., 1963.

ДЗЕСЮКЕВІЧ Сцяпан Канстанцінавіч [н. 19.12.1912(1.1.1913), мяст. Магільна Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Баранавіцкай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. У 1949 скончыў Вышэйшую парт. школу пры ЦК ВКП(б). У партызанах з кастр. 1942 — камандзір аддзялення, палітрук роты; з кастр. 1943 сакратар Ляхавіцкага падпольнага РК КП(б)Б, адначасова з лют. 1944 камісар *партызанскай брыгады № 19* імя В. М. Молатава Баранавіцкай вобл. З ліп. 1944 на парт. і сав. рабоце ў Ляхавічах, Баранавічах, Слоніме, Гродне. На XXI і XXII з'ездах КПБ выбіраўся канд. у чл. ЦК. Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

ДЗЕСЯТАЯ УСЕРАСІЙСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РКП(б) (нечарговая), адбылася 26—28.5.1921 у Маскве. Прысутнічала 239 дэлегатаў — прадстаўнікоў ад парт. і сав. арг-цый.

Парадак дня: 1) Эканам. палітыка (У. І. Ленін): а) харч. падатак (А. І. Свідэрскі), б) кааперацыя (Л. М. Хінчук), в) аб фін. рэформе (Я. А. Праабражанскі), г) дробная прамысловасць (У. П. Мілюцін); 2) Роля всерасійскіх з'ездаў Саветаў і мясцовых у падзены момант (К. Б. Радак); 3) III кангрэс Камінтэрна (К. Б. Радак); 4) Інфармацыя пра работу IV Усерас. з'езду прафсаюзаў (У. І. Ленін, В. М. Молатаў); 5) Арганіз. пытанне (Молатаў).

Канфер. склікана экстранна, каб дадаткова абмеркаваць пытанне пра ажыццяўленне *новай эканамічнай палітыкі* (нэпа), уведзенай *Дзесятым з'ездам РКП(б)* (1921). Работай канфер. кіраваў У. І. Ленін. Ён выступіў з дакладам пра харч. падатак, узначальваў камісію па падрыхтоўцы рэзалюцыі аб эканам. палітыцы і напісаў яе праект, выступаў з прамовамі. Ленін абгрунтаваў неабходнасць нэпа, паказаў сэнс гэтай палітыкі, падкрэсліў, што нэп уводзіцца «ўсур'ёз і надоўга», на ўвесь пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізма і з'яўляецца ўступкай не капіталістам, а сялянству з мэтай умацавання саюзу рабочага класа і прац. сялянства; паказаў значэнне гандлю — арганізаванага тавараабмену паміж дзярж. прамысловасцю і с. гасп.— як гал. звяна ва ўздыме эканомікі; спыніўся на задачы стварэння буйной прамысловасці, «...без якой матэрыяльны вытворчы базіс сацыялізма з'яўляецца немагчымым...» (Тв., т. 32, с. 386). Разам з тым Ленін паказаў першачарговасць уздыму с. гасп., падкрэсліў міжнар. значэнне гасп. поспехаў Краіны Саветаў. У рэзалюцыі «Аб эканам. палітыцы» канфер. запісала, што засваенне і правядзенне сав. і парт. работнікамі нэпа — карэнная паліт. задача моманту, падкрэсліла значэнне тавараабмену і кааперацыі для паспяховага ажыццяўлення нэпа. Канфер. зацвердзіла «План работы ЦК РКП(б)», у якім звярнула ўвагу на размеркаванне парт. сіл, вылучэнне і выхаванне новых кадраў; ухваліла пазіцыю камуніст. фракцыі 4-га з'езду прафсаюзаў, якая асудзіла антыпарт., анархa-сіндыкалісцкія погляды Д. Б. Разанава і М. П. Томскага ў пытанні пра ўзаемаадносіны партыі і прафсаюзаў.

Літ.: Ленін У. І. [Х Усерасійская канферэнцыя РКП(б). 26—28 мая 1921 г.], Тв., т. 32 (Полн. собр. соч., т. 43); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954. *Л. І. Валаховіч.* Мінск.

ДЗЕСЯТКОВАЯ СІСТЭМА ЗЛІЧЭННЯ, сістэма злічэння, пабудаваная на пазіцыйным (залежным ад месца) прынцыпе запісу лікаў з асновай 10. Мае 10 знакаў — лічбы 0, 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9.

Дзесяць адзінак 1-га разраду ўтвараюць адзінку 2-га разраду — лік 10, дзесяць адзінак 2-га разраду — адзінку 3-га разраду — лік 100 і г. д. Для запісу ліку вызначаюць, колькі ў ім адзінак найвышэйшага разраду; потым вызначаюць у астачы лік адзінак разраду на адзінку меншага і г. д. Атрыманыя лічбы запісваюць побач: $2 \cdot 10^3 + 4 \cdot 10^2 + 7 \cdot 10^1 + 1 \cdot 10^0 = 2471$. Дз. с. з.— найб. пашыранае. Гл. таксама *Злічэнне.*

ДЗЕСЯТКОВЫ ДРОБ, дроб, назоўнік якога ёсць цэлая ступень ліку 10. Дз. д. запісваюць без назоўніка, аддзяляючы ў лічніку справа коскай столькі лічбаў, колькі нулёў у назоўніку (напр., $\frac{785}{10} = 78{,}5$; $\frac{4}{100} = 0{,}04$).

Пры такім запісе Дз. д. лічбы, што стаяць злева перад коскай, абазначаюць цэлую частку дроба, першая лічба пасля коскі — дзесятыя долі, другая — сотыя і г. д. Рацыянальныя лікі, назоўнік якіх складаецца з простых множнікаў 2 і 5, запісваюцца канечным Дз. д., напр., $\frac{1}{5} = 0{,}2$. Калі ў назоўніку ёсць яшчэ інш. простыя множнікі — бесканечным перыядычным дробам, напр., $\frac{8}{15} = 0{,}533... = 0{,}5\ (3)$. Ірацыянальныя лікі запісваюцца неперыядычнымі Дз. д., напр., $\sqrt{2} = 1{,}4142...$.

ДЗЕСЯТЫ З'ЕЗД КП(б)Б, адбыўся 3—10.1.1927 у Мінску. 278 дэлегатаў з рашаючым голасам і 226 з дарадчым ад 30 995 чл. і канд. у чл. партыі.

Парадак дня: 1) Даклад ЦКК ВКП(б) (Я. Х. Петэрс); 2) Справаздачы ЦК КП(б)Б — паліт. і арганіз. (А. І. Крыніцкі, М. М. Галадзед); 3) Даклад Рэвіз. камісіі КП(б)Б (Дз. С. Чарнушэвіч); 4) Справаздача ЦКК КП(б)Б (В. А. Радус-Зяньковіч); 5) Вынікі гасп. буд-ва ў БССР і далейшыя задачы (Я. А. Адамовіч); 6) Выбары ЦК, ЦКК і Рэвіз. камісіі КП(б)Б.

З'езд падвёў вынікі работы КП(б)Б за 1926, ухваліў паліт. лінію і практ. дзейнасць ЦК КП(б)Б. Адзначыў поспехі сацыяліст. індустрыялізацыі рэспублікі і падкрэсліў, што БССР мае ўсе ўмовы для пабудовы сацыялізма. Вызначыў задачы гасп. буд-ва — павысіць удзельную вагу прамысловасці ў эканоміцы БССР, капітальныя ўкладанні на 1927 (7,9 млн. руб.) накіраваць пераважна на буд-ва эл. станцый, прамысл. прадпрыемстваў. Канстатаваў умацаванне пазіцый сацыялізма ў вёсцы (на ліп. 1926 кааперавана 22,9% сялянскіх гасп.); падкрэсліў неабходнасць уся-

мерпа развіваць прадукцыйныя сілы с. гасп.: вясці механізацыю, меліярацыю, землеўпарадкаванне, пашыраць плошчы пад тэхн. культурамі, падтрымліваць асн. віды с.-г. вытворчасці, ажыццяўляць эканамічны метад кіравання, умацоўваць гаспадарчы разлік, ліквідаваць дэфіцыт, ліквідаваць страты, павышаць якасць прадукцыі, ліквідаваць страты, павышаць якасць прадукцыі, ліквідаваць страты, павышаць якасць прадукцыі

ДЗЕСЯЦКІ, у Кіеўскай Русі старшы ў дзесятцы дружыннікаў князя; у Рускай дзяржаве 16—17 ст. асоба фармальна выбарная, а фактычна прызначаная феадалам ад кожных 10 сяліян для выканання адм.-паліцэйскіх функцый; у 1-й пал. 19 ст. ў Расіі ніжэйшая пасада земскай паліцыі на сяле; з 70-х г. 19 ст. фармальна выбарная ад 25—30 сялянскіх двароў паліцэйская асоба, якая дзейнічала пад кіраўніцтвам сельскіх старастаў і валасных старшынь.

«ДЗЕСЯЦЬ ЗАПАВЕДЗЕЙ ЧЫРВОНЫХ ПАРТЫЗАНАЎ БЕЛАРУСІ», клятва беларускіх партызанаў бязлітасна змагацца супраць польскіх акупантаў, аддаць усе сілы, а калі трэба і жыццё за Сав. ўладу, за свой народ. Надрукаваны ў падпольнай партыз. газ. *«Белорусская правда»* 7.6.1920 і ў многіх адозвах, якія раўспаўсюджваліся на тэр. Беларусі, акупаванай бурж. Польшчай. Гл. *Партызанскі рух на Беларусі ў гады грамадзянскай вайны.*

ДЗЕТКАВІЧЫ, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Энгельса. За 40 *км* на ПнЗ ад Драгічына, 102 *км* ад Брэста, 15 *км* ад чыг. ст. Антопаль, на шашы Антопаль — Бяроза. 709 ж., гасп. 229 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адд. сувязі, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДЗЕЦІ БАЯРСКІЯ, дробныя служылыя феадалы ў Рускай дзяржаве 15—18 ст.

Існуюць розныя версіі пра паходжанне Дз. б.: нашчадкі збяднелых баяр, княскіх дружыннікаў ці былыя баярскія васалы. Напачатку неслі службу ў удзельных князёў і баяр, з утварэннем Рус. цэнтралізаванай дзяржавы падпарадкаваны цэнтр. уладзе. Па становішчы Дз. б. лічыліся вышэйшымі за дваран. У 16 ст. падзяліліся на дваровых (служылі пры княскім ці царскім двары) і гарадавых (правінцыяльныя дваране), мелі вотчынныя землі. У пач. 18 ст. ў выніку таго, што служылыя людзі зліліся ў адзіны клас дваранства, тэрмін Дз. б. знік.

Літ.: Павлов-Сильванский Н. П. Государевы служилые люди..., 2 изд., СПб., 1909; Гуляев Е. О детях боярских и отроках княжеских и вообще о дворянах, служивших в России до конца XVIII ст., у кн.: Heraldica. Ист. сб., т. 1, СПб., 1900.

ДЗЕЦКАСЕЛЬСКАЯ, сталова-кармавы сорт бульбы, выведзены ва Усесаюзным ін-це раслінаводства міжвідавой гібрыдызацыяй (1959). Сярэднеранні, ураджайны. Клубні круглявыя, мякаць белая. Крухмалістасць 14—16%. Смакавыя якасці сярэднія. Ўстойлівасць добрая. Ракаўстойлівы. Раяпаваны ў БССР. Іл. гл. па ўкл. да арт. *Бульба.*

Літ.: Гл. пры арт. *Бульба.*

ДЗЁШЧАНКА, вёска ў Азерскім с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Суворава. За 39 *км* на ПнУ ад Узды, 38 *км* ад Мінска, на шашы Мінск — Слуцк. 150 ж., гасп. 60 (1971). Васьмігадовая школа, магазін. У 1944 вёска была спалена нямфаш. захопнікамі.

ДЗЁЯ, закончаная частка п'есы і спектакля (драм., опернага, балетнага). У кожнай Дз. пачынаецца і заканчваецца пэўнае звяно падзей. У 1-й Дз. звычайна даецца экспазіцыя і завязка драматург. канфлікту, у апошняй — развязка падзей. Кожная з прамежкавых Дз. заключае ў сабе цэласны этап драматург. развіцця. Падзел п'есы на Дз. ці акты звязаны з кампазіцыяй драмы, з яе стылем і жанрам.

ДЗЕЯЗДОЛЬНАСЦЬ, здольнасць асобы сваімі дзеяннямі набываць правы і ствараць для сябе абавязкі, а таксама несці асабістую адказнасць за свае неправамерныя дзеянні. У СССР поўная Дз. настае з 18 гадоў, а частковая (абмежаваная) — з 14. Непаўналетнія і псіхічна хворыя лічацца недзеяздольнымі. Яны могуць уступаць у здзелкі толькі са згоды бацькоў, апекуноў. Гл. таксама *Праваздольнасць.*

Літ.: Братусь С. Н. Субъекты гражданского права, М., 1950.

ДЗЕЯННЕ (у фізіцы), фізічная велічыня, якая мае размернасць здабытку энергіі на час (ці колькасці руху на перамяшчэнне). Гэтая велічыня адыгрывае істотную ролю ў механіцы (гл. *Варыяцыйныя прынцыпы механікі*), у электрадынаміцы, квантавай механіцы (гл. *Планка пастаянная*) і інш. раздзелах фізікі.

ДЗЕЯСЛОЎ, часціна мовы, якая абазначае працэс (фізічнае дзеянне, стан, выяўленне ці змену прыкметы, выражэнне адносін). Есць у грамат. сістэмах усіх моў, аднак у розных мовах з неаднолькавай колькасцю грамат. катэгорый.

У бел. мове, як і ў іншых славянскіх, Дз. асабліва багаты на грамат. катэгорыі; ён мае стан — незалежны, залежны і зваротна-сярэдні («касманаўт кіруе ракетай», «ракета кіруецца касманаўтам», «я збіраюся ў дарогу»), трыванне — закончанае і незакончанае («напісаць — пісаць»), лад — абвесны, умоўны і загадны («чытаю, чытаў бы, чытай»), час — цяперашні, будучы і прошлы («думаю, буду думаць — падумаю, думаў»), асобу — 1, 2 і 3-ю («працую, працуеш, працуе»), незваротнасць і зваротнасць («будаваць — будавацца»), лік — адзіночны і множны («працуе, працуюць»). Дз. ўмоўнага ладу і прошлага часу абвеснага ладу маюць род — мужчынскі, жаночы і ніякі («ішоў, ішла, ішло»). Асобныя формамі лічацца *інфінітыў, дзеепрыметнік* і *дзеепрыслоўе.* Сучасныя бел. формы — вынік працяглага развіцця Дз. У стараж.-бел. мове не процістаўляліся закончанае і незакончанае трыванні, затое было больш формаў часу (*перфект, плюсквамперфект,* будучы I, будучы II і інш.), якія паказвалі завершанасць ці працягласць дзеяння; часцей ужываліся дзеепрыметнікі. Словаўтварэнне Дз. надзвычай багатае прэфіксальнай («ехаць — аб'ехаць — выехаць — даехаць — з'ехаць — заехаць — наехаць — недаехаць — паехаць — пераехаць — прыехаць — уз'ехаць» і інш.); суфіксацыя, цыркумфіксацыя, кампазіцыя, лексіка-семант. і лексіка-сінтакс. спосабы ў сучаснай мове не вельмі прадуктыўныя. У сказе Дз. дапасуецца да назоўніка ці займенніка (калі яны дзейнікі) і кіруе назоўнікам ці займеннікам (калі яны дадатныя члены). Напр., у сказе «Калгаснікі сеюць жыта» дапасаванне «калгаснікі сеюць», кіраванне «сеюць жыта». Здольнасць кіраваць складанымі часцінамі мовы, што выступаюць як дапаўненне ці акалічнасць, уласцівая ўсім формам Дз. Кіраванне бывае непасрэднае, без прыназоўніка («будаваць школу»), ці апасродкаванае, з прыназоўнікам («працаваць з сябрам»). Некат. Дз. могуць адначасова кіраваць 2—3 назоўнікамі («пісаць алоўкам аквараллю на паперы»). Асн. сінтакс. роля — быць *выказнікам.* Інфінітыў, дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе выступаюць і як дзейнікі, азначэнні, дапаўненні, акалічнасці.

Літ.: Шуба П. П. Дзеяслоў у беларускай мове, Мн., 1968; Мацкевіч Ю. Ф. Марфалогія дзеяслова ў беларускай мове, Мн., 1959; Граматыка беларускай мовы, т. 1 — Марфалогія, Мн., 1962.

П. П. Шуба. Мінск.

ДЗЕГАЦЬ (смала), прадукт, што ўтвараецца з цвёрдага паліва пры награванні яго без доступу паветра. Густая цёмная вадкасць, складаецца з насычаных, гідраараматычных і араматычных вуглевадародаў, фенолаў і гетэрацыклічных злучэнняў. У залежнасці ад сыравіны адрозніваюць каменнавугальны, буравугальны, сланцавы, тарфяны, драўняны, бяроставы і сапрапелевы. Кам.-вуг. Дз. ужываецца як сыравіна ў сінтэзе фарбавальнікаў, выбуховых, лекавых і пахучых рэчываў, а таксама як вяжучы матэрыял у дарожных пакрыццях, толі, дахавых плітах, масціках і лаках. Бяроставы Дз. ужываюць пры вырабе скуры (юхту), у медыцыне і ветэрынарыі. Гл. таксама *Сухая перагонка драўніны.*

І. І. Вардыпаў. Мінск.

ДЗЕМІН Іван Міхайлавіч [н. 20.12.1914 (2.1.1915), в. Хацісіна Калужскага пав.], гасп. дзеяч, адзін з арганізатараў аўтамаб. прамысловасці БССР. Чл. КПСС з 1948. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Скончыў Маскоўскі тэкстыльны ін-т (1941). З 1944 на Мінскім аўтамаб. з-дзе: нам. гал. энергетыка, гал. энергетык, сакратар парткома, з 1959 дырэктар з-да. Дэлегат XXII, XXIV з'ездаў КПСС. На XXVI з'ездзе КПБ выбраны канд. у чл. ЦК, на XXVII — чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 6-га скл. і Вярх. Савета БССР 7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

ДЗЁМІН Мікалай Тарасавіч (н. 1922, пас. Вольны Краснаслабодскага пав. Пензенскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 16.10. 1943 пад агнём праціўніка першы пераправіўся цераз Дняпро каля Лоева, уварваўся ў варожыя траншэі, удзельнічаў у баі за плацдарм.

ДЗЕННАЕ КІНО, дэманстраванне кінафільмаў удзень або пры штучным асвятленні.

Для Дз. к. выкарыстоўваюць звычайную кінаапаратуру і фільмы. Асн. віды кінаўстановак Дз. к.— «на праспект» і «на адбітак». У першым выпадку гледачы бачаць фільм на праспектыўным экране (кінапраектар па-за экранам), у другім — на адлюстравальным экране (праектар перад экранам).




Схема ўстаноўкі дзённага кіно «на праспект»: *1* — праектар; *2* — экран; *3* — «шахта»; *4* — месцы для гледачоў; *5* — цепавы шчыт.

У абодвух выпадках экран засцерагаюць ад засвечвання пабочнымі крыніцамі святла з дапамогай «шахты» ці казырка. Адрозніваюць стацыянарныя і перасоўныя ўстаноўкі Дз. к. Сеансы Дз. к. могуць дэманстравацца ў адкрытых кінатэатрах, на палявых станах. Дз. к. карыстаюцца таксама ў навуч. працэсе, для рэкламы.

Літ.: Васов М. М. и др. Дневное кино, М., 1951.

ДЗЕННІК, храналагічны запіс падзей, у якіх аўтар сам удзельнічаў ці быў іх сведкам. У Дз. матэрыял дакументальны і звычайна падаецца ад імя першай асобы.

Сустракаецца ў стараж. л-ры (Ксенафонт, Цэзар). Як жанравая разнавіднасць маст. прозы і як аўтабіягр. запісы пашыраецца пачынаючы з эпохі Адраджэння. Дз. пісьменнікаў, мастакоў, грамадскіх і ваен. дзеячаў маюць навук. і пазнавальнае значэнне. У бел. л-ры вядомы «Дзённік Люблінскага сейма 1569 г.», «Дзённік» Ф. Еўлашоўскага, дзённікі Я. Коласа, К. Чорнага, «Лісткі календара» М. Танка і інш. Да Дз. блізкія «запіскі», «пісьмы», «споведзі».

ДЗЕННІК ЛЮБЛІНСКАГА СЕЙМА 1569, зборнік матэрыялаў аб'яднанага польска-літоўскага сейма, які праходзіў у Любліне ў студз.— жн. 1569 і прыняў т. зв. *Люблінскую унію 1569.* На рус. мове апублікаваны ў 1869 М. В. Каяловічам.

Публ.: Дневник Люблинского сейма 1569 года. Соединение Великого княжества Литовского с Королевством Польским, СПб., 1869.

«ДЗЁННІК» ФЁДАРА ЕЎЛАШОЎСКАГА, помнік беларускай свецкай мемуарнай літаратуры 2-й пал. 16 ст. Склаў навагрудскі падсудак (адвакат) Ф. *Еўлашоўскі.* Матэрыялам паслужылі нізірані аўтара над мясцовым жыццём і ўражанні, звязаныя з яго юрыд. дзейнасцю. Дзённік мае матэрыял для вывучэння паліт. і культ. жыцця, светапогляду, побыту, адносін да падзей прадстаўнікоў розных класаў таго часу і перш-наперш шляхты; падкрэслівае сімпатыі народа да Маскоўскай дзяржавы, страх польскіх феадалаў перад магчымым саюзам Вял. кн. Літ. з Руссю, дае характарыстыкі многіх вядомых асоб, у т. л. аршанскага старосты Ф. *Кміты-Чарнабыльскага.* Крыніца вывучэння бел. літаратурнай мовы таго часу. Упершыню апублікаваў укр. гісторык У. Б. Антановіч (час. «Киевская старина», 1886, т. 14, студз.).

Публ.: Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси, в. 2, Киев, 1896; у кн.— Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры, Мн., 1959.

У. У. Грамовіч. Мінск.

ДЗЯРНАВІЧЫ, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл., каля р. Дрысы (2 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кульнева. За 40 *км* на У ад Верхнядзвінска, 123 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Боркавічы, на шашы Полацк — г. п. Асвея. 401 ж., гасп. 125 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, сталовая, магазін. У 1943 ням.-фаш. захопнікі загубілі 52 мірных жыхароў вёскі. Помнік на брацкай магіле 58 сав. воінаў Айчыннай вайны.

ДЗЯРНАВІЧЫ, вёска ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дзярнавічы». За 40 *км* на ПдУ ад Нароўлі, 218 *км* ад Гомеля, 30 *км* ад чыг. ст. Янаў (УССР), 4 *км* ад прыстані Дзярнавічы на Прыпяці. 892 ж., гасп. 338 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, адд. сувязі. У 1943 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску.

ДЗІВАННА (Verbascum), род адна- і двухгадовых траў, радзей паўкустоў сям. залознікавых. Вядома больш за 240 відаў, пашыраных у Еўропе, Зах. Азіі, Паўн. Афрыцы, Паўн. і Цэнтр. Амерыцы. У СССР 46 відаў, на Беларусі 7.

Расліны звычайна апушаныя, выш. да 150 см. Лісце цэласнае, прадаўгавата-эліптычнае, у аснове сцябла часта сабранае ў разетку. Кветкі жоўтыя, чырвоныя, белыя, у складаных гронках. Расце Дз. на пясчаных мясцінах, лясных палянах, лугах, на берагах рэк, каля дарог і як пустазелле на палях

і агародах. Найб. вядомыя на Беларусі — Дз.-мядзведжае вуха (V. thapsus, нар. назвы: каўтунічнік, касмак, шальнік), Дз. скіпетрападобная (V. thapsiforme, нар. назва лісіц), Дз. касматая (V. phlomoides). Кветкі іх ужываюцца ў медыцыне (грудны чай). Дз. філялетавая і Дз. тараканавая вырошчваюцца як дэкаратыўныя.

Літ.: Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968.

ДЗІВАСІЛ (Inula), род шматгадовых травяністых раслін, радзей кустоў сям. складанакветных. Вядома 100 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі і Афрыцы. У СССР каля 40 відаў, на Беларусі 3: Дз. брытанскі (I. britanica, нар. назва бараўнік), Дз. шурпаты (I. hirta), Дз. вербалісты (I. salicina).



Дзівасіл высокі.

Сцябло гладкае або апушанае, выш. да 170 *см*. Лісце ідласнае. Кветкі дробныя, жоўтыя, сабраныя ў кошыкі. Расце Дз. па берагах рэк, на заліўных лугах, у лясах. Меданосныя, дэкар. і фарбавальныя расліны. Дз. высокі, дзікі сланечнік (I. helenium), лекавая расліна, у карэнішчах ёсць эфірны алей, інулін (44%). Прэпараты з яго ўжываюцца ў медыцыне.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ДЗІВІН, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл., каля воз. Любань (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Новае жыццё». За 33 *км* на ПдУ ад Кобрына, 78 *км* ад Брэста, 36 *км* ад чыг. ст. Кобрын; аўтобусныя зносіны з Кобрынам. 4877 ж., гасп. 1407 (1971). 2 лясніцтвы, маслазавод, сушыльны з-д, пякарня, філіял Кобрынскай мэблевай ф-кі, аддз. Сельгастэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, васьмігадовая школа, Дом культуры, клуб, 3 б-кі, 2 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, бальніца, аптэка, вет. лячэбніца, аддз. сувязі, сталовая, 11 магазінаў. Помнік на брацкай магіле 1450 мірных жыхароў, якіх загубілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 71 сав. воіну і партызану, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЗІВІН Раман Антонавіч (19.11(1.12).1893, в. Кальнікі Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 21.3.1957), удзельнік грамадз. вайны. Ген.-м. артылерыі (1940). З сяляп. Чл. КПСС з 1918. Скончыў Вышэйшую артыл. школу (1922), Вышэйшую ваен. пед. школу (1927). У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з крас. 1918. З снеж. 1918 да сак. 1921 на Паўд., Зах., Паўн.-Зах. франтах — камандзір узвода, батарэі; удзельнік разгрому краснаградскага мяцяжу. У Айч. вайну пач. ППА Паўд.-Зах. напрамку, камандзір зенітна-артыл. дывізіі Цэнтр. фронту. Удзельнік абароны Палтавы, Харкава, Варонежа, баёў каля Белгарада, на Арлоўска-Курскай дузе. З 1945 у войсках ППА, Гал. штабе ВПС. З ліст. 1950 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.

ДЗІДА, старажытная кало́чная зброя; род лёгкага кап'я або пікі з металічным наканечнікам, асаджаным на доўгае цаўё. Падобную паляўнічую прыладу наз. таксама дзідка, рагаціна.

ДЗІДЗЕНКА Рыгор Васілевіч [н. 31.1(13.2). 1917, в. Навапаўлаўка Тургайскай вобл.], беларускі савецкі артыст эстрады. Засл. арт. БССР (1963). Скончыў Варонежскае тэатр. вучылішча (1938). У 1938—41 чытальнік Ансамбля песні і танца пагранвойск БССР. Удзельнік партыз. руху на Беларусі (1942—44). З 1946 нач. Мінскага абл. аддзела мастацтва. З 1947 у Белдзяржфілармоніі, артыст гутарковага жанру. Аўтар і выканаўца сатыр. куплетаў, мініяцюр, фельетонаў. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

ДЗІДЗІЧЭНКА Ірына Дзянісаўна (н. 22.8. 1936, Ленінград), беларуская савецкая артыстка балета. Засл. арт. БССР (1964). Пасля сканчэння Ленінградскага харэагр. вучылішча (1955) салістка т-раў оперы і балета Чэлябінска і Новасібірска, з 1959 — Бел. т-ра оперы і балета. Выконвае характарныя партыі (фея Карабос у «Спячай красуні» П. Чайкоўскага, Мерседэс у «Дон Кіхоце» Л. Мінкуса, Марта ў «Святле і ценях» Г. Вагнера, Мадэрнісцкая танцоўшчыца ў «Мары» Я. Глебава), характарныя танцы ў балетах і операх.

ДЗІДЛО (Didelot) Шарль (Карл) Луі (1767, Стакгольм — 19.11.1837), французскі артыст балета, балетмайстар і педагог. У 1801—29 танцоўшчык і балетмайстар у Пецярбурзе (з перапынкам у 1811—16). Паставіў у Расіі больш за 40 твораў (сярод іх «Каўказскі нявольнік» з муз. К. Каваса — першая інсцэніроўка пушкінскай паэмы). Садзейнічаў сцвярджэнню рамантызму ў балеце. З 1804 узначальваў Пецярбургскую тэатр. школу.

Літ.: Слонимский Ю. Дидло. Вехи творческой биографии. Л.— М., 1958.

ДЗІДРО (Diderot) Дэні (5.10.1713, Лангр — 31.7.1784, Парыж), французскі філосаф-матэрыяліст, пісьменнік і тэарэтык мастацтва. Заснавальнік і рэдактар «Энцыклапедыі, або Тлумачальнага слоўніка навук, мастацтваў і рамёстваў» (1751—80). У філасофіі прайшоў шлях ад *дэізму* да ваяўнічага матэрыялізму і атэізму. У асн. філас. творах «Думкі пра тлумачэнне прыроды» (нап. 1754), «Размова Д'Аламбера з Дзідро» (нап. 1769), «Філасофскія прынцыпы матэрыі і руху» (нап. 1770), «Пляменнік Рамо» (нап. 1762—69) адстойваў прынцыпы аб'ектыўнага існавання матэрыі. У метафіз. і механістычнае разуменне прыроды, якое тады панавала, унёс некат. элементы дыялектыкі (сувязь матэрыі і руху, вечная зменлівасць прыродных формаў, унутраная актыўнасць матэрыі, народжаная яе разнаякаснасцю). Дз. адстойваў ідэю адзінства матэрыі і свядомасці, выказаў думку пра ўсеагульную адчувальнасць матэрыі, прадугадаў некат. палажэнні эвалюц. вучэння. Мэту пазнання бачыў ва ўзвышэнні чалавека над сіламі прыроды. У разуменні грамадскага



жыцця Дз. астаўся на пазіцыях ідэалізму. Характар грамадскага ладу ставіў у залежнасць ад паліт. арг-цыі грамадства, заканадаўцаў і ідэй, якія пануюць. Крытыкаваў феад. дэспатызм, выступаў за канстытуцыйную манархію, у канцы жыцця выказваў рэсп. ідэі. У час, калі наведаў Расію (1773—74), дарэмна імкнуўся пераканаць Кацярыну II адмяніць прыгон і ажыццявіць інш. прагрэс. рэформы. У працах па эстэтыцы — «Салоны» (нап. 1759—81), «Парадокс пра акцёра» (нап. 1773) адстойваў рэаліст. кірунак у мастацтве, абараняў ідэю адзінства дабра і прыгажосці. У мастацкіх творах — «Манашка» (нап. 1760), «Жак-фаталіст» (нап. 1773) намаляваў карціны франц. жыцця 18 ст., якія выкрывалі абсалютызм і каталіцкую царкву. На Беларусі вучэнне Дз. значна пашырылася ў апошняй трэці 18 ст. Яго «Энцыклапедыя» была ў бібліятэках навуч. устаноў і ў прыватных зборах. Для «Энцыклапедыі» М. К. Агінскі напісаў арт. «Арфа». Эстэт. ідэі «Энцыклапедыі» прапагандаваў у сваіх творах Ф. Н. Галянскі.

Тв.: Рус. пер.— Собр. соч., т. 1—10, М.— Л., 1935—47; Избр. произв., М.— Л., 1951; Избр. атеистические произв., М., 1956.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Святое семейство, Соч., т. 2, с. 145; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, с. 24—27, 34—36, 101, 114 (Поли. собр. соч., т. 18, с. 28—32, 40—42, 113, 127); Яго ж. Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму, Тв., т. 33 (там жа, т. 45); Плеханов Г. В. Очерки по истории материализма, у яго кн.: Избр. философские произв., т. 2, М., 1956; Луполл Н. К. Дени Дидро, М., 1960.

А. А. Бірала. Мінск.

ДЗІК, дзікі вепрук, дзікая свіння (Sus scrofa), млекакормячая жывёла атр. парнакапытных; адзін з родапачынальнікаў свойскіх свіней. Пашыраны ў Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы; на Беларусі па ўсёй тэр. (1969, каля 15 тыс.).

Даўж. да 2 *м*, маса да 300 *кг*. Цела ўкрыта доўгім, пераважна бурым шчаціннем з падшэрсткам. Рыла доўгае. У ніжняй сківіцы 2 іклы (даўж. іх у самцоў 6—10 *см*). Жыве невялікімі статкамі. Начная ўседная жывёла. Нараджае 3—12 палосатых парасят. Шкодзіць пасевам. Каштоўны аб'ект промыслу. На Беларусі штогод адстрэльваюць 400—500 Дз. Выкарыстоўваецца багатае на вітаміны і мікраэлементы мяса, а таксама шкура і шчаціннё. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Белавежская пушча.*

Літ.: Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961 (бібліягр.).

Б. З. Галадушка. Мінск.

ДЗІКАБРАЗАВЫЯ, дзікабразы (Hystricidae), сямейства млекакормячых атр. грызуноў. Каля 20 відаў, пашыраных у Пярэдняй, Сярэдняй і Паўд. Азіі, Паўд. Еўропе, Афрыцы. У СССР — 1 від — дзікабраз звычайны (Hystrix cristata).

Цела ўкрыта тоўстымі моцнымі іголкамі (даўж. на загрыўку да 40 *см*) і цвёрдым шчаціннем; на жываце, нагах, галаве валасоў мала. Даўж. да 90 *см*, маса да 15 *кг*. Жыве ў глыбокіх норах пераважна ў перадгор'ях і ў гарах. Корм расліны. Нараджае 2—4 дзіцянят. Месцамі шкодзіць садам, бахчам, агародам. Пераносіць узбуджальнікаў клішчовага энцэфаліту, бруцэлёзу. Мяса дзікабраза ядомае. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Грызуны.*

Літ.: Колосов А. М., Лавров Н. П. и Наумов С. П. Биология промысловых зверей СССР, М., 1965.

ДЗІКАЕ, возера ў бас. р. Трэмлі, левага прытока Прыпяці, у Петрыкаўскім р-не Гомельскай вобл. Пл. 0,78 *км²*. Даўж. 1,2 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,65 *км*. Катлавіна круглявая, у забалочаным паніжэнні. Вадазбор у межах Прыпяцкага Палесся, забалочаны. Дз. моцна зарастае, перыядычна праточнае. Водзяцца плотка, акунь, карась, шчупак.

ДЗІКАЕ, балотны масіў пізіннага тыпу ў паўн. ч. Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. і ў паўд. ч. Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. За 13 *км* на ПнЗ ад г. Пружаны. Утварыўся ад затарфоўвання шырокай праточнай катлавіны на Балтыйска-Чарнаморскім водападзеле. Жыўленне грунтавымі водамі і атм. ападкамі. Плошча балота 21,7 тыс. *га*. Макс. магутнасць тарфянога пласта 3,6 *м*, сярэдняя 1,4 *м*. На паглыбленых участках месцамі падсцілаецца кальцыевым сапрапелем, які паслядоўна перакрываецца асакова-гіпнавым, дрэўна-чароставым, асаковым і асакова-гіпнавым торфам. Выкарыстоўваецца пад ворыва, сенажаці, часткова заняты лесам.

ДЗІКАН Ігнат Максімавіч (май 1900, в. Раеўская Мазырскага пав. Мінскай губ.— 13.2. 1948), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч вайну. Ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1926. У 1919—38 на сав. рабоце ў Гомельскай вобл. З 1938 старшыня Церахоўскага і Стрэшынскага райвыканкомаў. У Айч. вайну ў тыле ворага. З ліп. 1942 камандзір, камісар *партызанскай брыгады 10-й Журавіцкай*, адначасова сакратар Журавіцкага падпольнага РК КП(б)Б Гомельскай вобл. З кастр. 1943 нач. аператыўнай групы БШПР пры 1-м Бел. фронце. З кастр. 1944 нам. старшыні Бабруйскага аблвыканкома. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

ДЗІКАСЦЬ, 1) тэрмін, якім Л. Г. *Морган* абазначыў першы перыяд культурна-гістар. перыядызацыі гісторыі чалавецтва. Папярэднічае *варварству* і цывілізацыі, ахоплівае перыяд ад з'яўлення чалавека да вынаходства ганчарнага круга. У археал. перыядызацыі адпавядае *палеаліту* і *мезаліту*. Сав. вучоныя на падставе работ Ф. Энгельса і У. І. Леніна распрацавалі новую перыядызацыю гісторыі першабытнага грамадства. Гл. *Першабытнаабшчынны лад*. 2) У звычайным словаўжыванні — крайняя ступень некультурнасці.

ДЗІКАЯ КАЗА, гл. *Казуля.*

ДЗІКАЯ СВІННЯ, гл. *Дзік.*

ДЗІКЕВА, вёска ў Германавіцкім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Апора міру». За 25 *км* на ПнУ ад Шаркоўшчыны, 200 *км* ад Віцебска, на шашы в. Германавічы — в. Новы Пагост. 153 ж., двароў 51 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін.

ДЗІКЕНС (Dickens) Чарлз (7.2.1812, Лэндпарт каля Портсмута — 9.6.1870), англійскі пісьменнік, выдатны прадстаўнік англ. крытычнага рэалізму 19 ст. З сям'і беднага чыноўніка. Працаваў стэнографам у парламенце і газетным рэпарцёрам. Першая кн. «Нарысы Боза» (1836) — серыя камедыйных замалёвак побыту лонданскага мяшчанства, напісаная



ў стылі бытавой карыкатуры, жывой гутарковай мовай. Папулярнасць набыў раман «Пасмяротныя запіскі Піквікскага клуба» (1836—37), дзе вачыма гал. героя — аптыміста-дзівака — даецца шырокая карціна англ. грамадства. У першым вялікім сац. рамане «Прыгоды Олівера Твіста» (асобн. выд. 1838) пра лёс хлопчыка, выхаванца рабочага прытулку, рэалістычна паказаў жыццё лонданскага «дна»; шчаслівая развязка ў рамане пададзена з дыдактычнымі мэтамі. У рамане «Жыццё і прыгоды Нікаласа Ніклбі» (1838—39) бязлітасна выкрыў англ. сістэму выхавання. Пасля падарожжа ў Амерыку апублікаваў «Амерыканскія нататкі» (1842) і раман «Жыццё і прыгоды Мартына Чазльуіта» (асобн. выд. 1844), дзе, карыстаючыся прыёмамі карыкатуры і шаржу, высмеяў прадажнасць і крывадушнасць бурж. прэсы, культ долара, асудзіў іллюзіі амер. дэмакратыі. Раману «Домбі і сын» (1846—48) уласцівыя найлепшыя якасці творчасці Дз.: выключная сіла рэаліст. абагульнення, тонкі псіхалагізм, спалучэнне востры сатыры з мяккім гумарам і тонкай іроніяй, багацце мовы і вобразаў. Паслабленне сац. накіраванасці ў творчасці Дз. вылівалася ў адыходзе ад паказу значных грамадскіх канфліктаў, ва утапічнай мары пра мірнае пераўтварэнне грамадства і класавую гармонію («Каляднія аповесці», 1843—48; аўтабіягр. раман «Жыццё Давіда Каперфілда...», 1849—50). У рамане «Халодны дом» (асобн. выд. 1853) пераканаўча паказаў заганы бурж. правасуддзя. Праблему ўзаемадносін паміж прадпрыемцамі і рабочымі паставіў у рамане «Цяжкія часіны» (1854), дзе з вялікай сімпатыяй намаляваў вобразы людзей з народу. Аўтар раманаў «Маленькая Дорыт» (1855—57), «Аповесць пра два гарады» (1859), «Вялікія чаканні» (асобн. выд. 1861), «Наш агульны сябар» (1864—65) і інш. Творчасць Дз. высока ацэньвалі К. Маркс і Ф. Энгельс, В. Бялінскі, М. Чарнышэўскі, М. Салтыкоў-Шчадрын, Ф. Дастаеўскі, М. Горкі. Паводле твораў Дз. т-р імя Я. Коласа паставіў спектакль «Жорсткі свет» (1953).

Тв.: Бел. пер.— Домбі і сын, Мн., 1938; Вялікія чаканні, Мн., 1940; рус. пер.— Собр. соч., т. 1—30, М., 1957 — 63.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967 (гл. ў т. 2 Паказальнік імён); Белинский В. Г. Оливер Твист, Полн. собр. соч., т. 5, М., 1954; Ивашева В. В. Творчество Диккенса, М., 1954; Сильман Т. И. Диккенс. Очерки творчества, Л., 1970; Михальская Н. П. Чарльз Диккенс. Очерк жизни и творчества, М., 1959; Кастарский И. М. Диккенс в России. Середина XIX в., М., 1966; Пирсон Х. Диккенс, пер. с англ., М., 1963; Чарльз Диккенс. Библиогр. рус. переводов и критич. лит. на рус. языке. 1838—1960, М., 1962.

Н. А. Салаўёва.

ДЗІКІ Аляксей Данісавіч [12(25).2.1889, Екацярынаслаў — 1.10.1955], рускі савецкі рэжысёр, акцёр, педагог і тэатр. дзеяч. Нар. арт. СССР (1949). Праф. (1948). У 1910 пачаў творчую дзейнасць акцёрам МХТа. Спектаклі, пастаўленыя Дз., вызначаліся тэатр. выразнасцю, сакавітасцю фарбаў, гумарам, жыццялюбствам, філасофскаю глыбінёй. Лепшыя: «Блыха» (1925, МХАТ 2-і) і «Лэдзі Макбет Мцэнскага павета» (1935, студыя Дз.) паводле М. Ляскова, «Чалавек з партфелем» А. Файко (1928) і «Першая конная» У. Вішнеўскага (1930) у Маск. т-ры Рэвалюцыі, «Глыбокая правінцыя» М. Святлова (1935, Маск. т-р імя ВЦСПС), «Цені» М. Салтыкова-Шчадрына (1953, Маск. т-р імя Пушкіна). Вядомая роля — Іван Горлаў у «Фронце» А. Карнейчука. Здымаўся ў кіно («Адмірал Нахімаў», «Сталінградская бітва» і інш.). Педагог яўр. сектара Бел. драм. студыі ў Маскве, рэж. «Свята ў Касрылаўцы» паводле Шолам-Алейхема (1926). Кіраўнік пастаноўкі «Недарэчнасць» К. Фіна ў БДТ-2 (т-р імя Я. Коласа, 1934), кансультант пастаноўкі «Гісторыя пяці хвастоў» Л. Левіна ў БДТ-3 (1934). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1949 (дзве), 1950. Узнаг. ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырв. Сцяга.

Тв.: Повесть о театральной юности, М., 1957; Статьи. Переписка. Воспоминания, М., 1967.

ДЗІКІ ВІНАГРАД, тое, што *дзікачы вінаград*.

«ДЗІКІЯ», плынь у французскім жывапісе пач. 20 ст. Гл. *Фавізм*.

ДЗІКЎН Сяргей Мікалаевіч (н. 30.7.1922, в. Кнышэвічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.), Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў БДУ імя Леніна (1958). У 1946—61 на парт. і сав. рабоце ў Бабруйскім абкоме КПБ, Старобінскім, Кіраўскім РК КПБ, Шклоўскім райвыканкоме. З 1961 першы сакратар Шклоўскага РК КПБ Магілёўскай вобл. На XXVII з'ездзе КПБ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Пошук вядуць камуністы, Мн., 1969.

ДЗІКУШКІ, вёска ў Ходараўскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл., каля р. Лебяда (1 *км*). Цэнтр калгаса «Беларусь». За 52 *км* на ПдЗ ад Ліды, 111 *км* ад Гродна, 10 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы, каля шашы в. Беліца — г. п. Жалудок (1 *км*). 120 ж., гасп. 30 (1971). Клуб, б-ка, магазін.

ДЗІКУШЫН Уладзімір Іванавіч [н. 26.7 (8.8).1902, Самара], савецкі вучоны ў галіне станкабудавання. Акад. АН СССР (1953, чл.-кар. 1943). Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскае вышэйшае тэхн. вуч. (1928). З 1932 у Эксперыментальным НДІ металарэзных станкоў. Пад кіраўніцтвам Дз. распрацаваны сістэма агрэгатавання станкоў і тыпавыя станкі для аправаўкі целаў вярчэння ў аўтам. лініях. Гал. інжынер праекта першага ў СССР аўтам. з-да поршняў. Працы па асн. праблемах станкабудавання, распрацоўцы навук. асноў праектавання металарэзных станкоў. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1951. Узнаг. 3 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Літ.: Дикушин Владимир Иванович, «Вестник АН СССР», 1954, № 4; Петров И. И. Владимир Иванович Дикушин, «Автоматика и телемеханика», 1953, т. 14, № 3.

ДЗІМАМЕРКІ, вёска ў Ручаёўскім с/с Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Камуніст». За 25 *км* на ПдЗ ад Лоева, 117 *км* ад Гомеля, 50 *км* ад чыг. ст. Хойнікі, на шашы Брагін — Лоеў. 284 ж., двароў 77 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ДЗІМАЎ Дзімітр (25.6.1909, Ловеч — 1.4. 1966), балгарскі пісьменнік. Чл. БКП з 1946. Праф. Сафійскага с.-г. ін-та імя Г. Дзімітрова (з 1953). Дэбютаваў псіхалагічным раманам «Паручнік Бенц» (1938). Раман «Асуджаныя душы» (1945) напісаны на матэрыяле антыфаш. барацьбы ў Іспаніі. Найбольш значны твор — раман «Тытунь» (1951, Дзімітроўская прэмія 1952). У ім Дз. раскрывае вострыя сац. канфлікты ў даваенпёўскай Балгарыі, паказвае ідэйны крах, маральнае падзенне балг. буржуазіі, рост рэвалюц. барацьбы пар. мас. Аўтар сатыр. п'есы «Жанчыны з мінулым» (1959), псіхалагічнай драмы «Вінаваты» (1961), сац.-паліт. і філас. драмы «Перадышка ў Арка Ірыс» (1963).

Тв.: Събрани съчинения, т. 1—6, София, 1966—67; рус. пер.— Женщины с прошлым, М., 1959; Осужденные души, М., 1963; Передышка в Арко Ирис, М., 1967; Табак, ч. 1—2, М., 1969.

Н. С. Гілевіч. Мінск.

ДЗІМІТРОЎ Георгій Міхайлавіч (18.6.1882, в. Кавачэўцы Радамірскай акалі — 2.7.1949), дзеяч балгарскага і міжнар. рабочага руху. Сын беднага рамесніка. З юнацтва ўдзельнічаў у рабочым руху. З 1902 чл. Балг. рабочай с.-д. партыі. У 1904—05 сакратар Сафійскай парт. арг-цыі, у 1909—23 сакратар агульнага рабочага прафесійнага саюза. У ліст. 1913 выбраны дэпутатам Нар. сходу. Трыбуну парламента выкарыстоўваў для выкрыцця шавіністычнай, захопніцкай палітыкі балг. буржуазіі. За рэвалюц. і антываен. дзейнасць няраз праследаваўся. З дня існавання *Балгарскай камуністычнай партыі* нязменны член яе ЦК. Дз. узначаліў масавыя выступленні балг. працоўных на абарону маладой Сав. краіны. Удзельнічаў у рабоце III кангрэсу Камінтэрна (1921) у Маскве, дзе сустракаўся з У. І. Леніным. З В. *Каларавым* узначаліў *Вераснёўскае антыфашысцкае паўстанне 1923*. Пасля яго паражэння эмігравaў (у 1923 і 1926 балг. фаш. суд завочна прыгаварыў Дз. да пакарання смерцю). Працаваў у Выканкоме Камінтэрна. Шмат увагі аддаваў умацаванню братніх кампартый, развіццю рэвалюц. руху ў еўрап. краінах. У студз. 1926 удзельнічаў у рабоце III канферэнцыі КПЗБ. 9.3.1933 арыштаваны ў Берліне і беспадстаўна абвінавачаны ў падпале рэйхстага. На *Лейпцыгскім працэсе 1933* выкрыў злачынную сутнасць фашызму, абараніў гонар камуніста і балг. народа, заклікаў народы свету змагацца супраць фашызму і вайны. Пратэст прагрэс. грамадскасці свету супраць правакацыйнага працэсу ў Лейпцызе і рашэнне Сав. ўрада аб прыняцці Дз. пад сав. падданства (балг. ўрад не дазволіў яму вярнуцца на радзіму) памаглі Дз. вырвацца з фаш. катавальні, выехаць у Сав. Саюз. На VII кангрэсе Камінтэрна (1935) выбраны ген. сакратаром Выканкома. Быў на гэтай пасадзе да самароспуску Камінтэрна (1943). У 1937—45 дэпутат Вярх. Савета СССР. У 2-ю сусв. вайну шмат зрабіў для арганізацыі антыфаш. руху ў акупаваных краінах, кіраваў барацьбой БКП і балг. патрыётаў супраць гітлераўскіх захопнікаў і манарха-фаш. дыктатуры ў Балгарыі. Ініцыятар стварэння Айч. фронту, пад сцягам якога балг. народ адзейсніў сацыяліст. рэвалюцыю, усталяваў нар.-дэмакр. лад. За заслугі ў барацьбе супраць фашызму Прэзідыум Вярх. Савета СССР узнагародзіў (1945) Дз. ордэнам Леніна. У ліст. 1945 вярнуўся ў Балгарыю. З 22.11.1946 старшыня Савета Міністраў НРБ. На V з'ездзе партыі (1948) выбраны ген. сакратаром ЦК Балгарскай рабочай партыі (камуністаў). Дз. зрабіў значны ўклад у развіццё марксісцка-ленінскай думкі. У дакладзе на VII кангрэсе Камінтэрна творча абагульніў вопыт міжнар. камуніст. і рабочага руху, абгрунтаваў ідэю адзінага рабочага і нар. антыімперыяліст. фронту супраць фашызму і пагрозы вайны. На V з'ездзе БКП тэарэтычна прааналізаваў характар, ролю і перспектывы нар. дэмакратыі. Пад кіраўніцтвам Дз. распрацавана праграма будаўніцтва сацыялізма ў НРБ.



Тв.: Съчинения, т. 1—14, София, 1951—55 (Справочник към съчиненията..., София, 1957); рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, София, 1967—68.

Літ.: Соханъ П. С. Пламенный революционер, 2 изд., Киев, 1969.

ДЗІНАРАЎКА, вёска ў Азярыцка-Слабадскім с/с Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Гагарына. За 9 *км* на З ад Смалявіч, 28 *км* ад Мінска, 6 *км* ад чыг. ст. Гарадзішча, на шашы Мінск — Смалявічы. 157 ж., гасп. 46 (1971). Клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

ДЗІРАК (Dirac) Поль Адрыен Марыс (н. 8.8. 1902, Брысталь), англійскі фізік-тэарэтык, адзін са стваральнікаў *квантавай механікі*. Чл. Лонданскага каралеўскага т-ва (1930), праф. Кембрыджскага ун-та (1932), замежны чл. АН СССР (1931). Распрацаваў асновы квантавай тэорыі



выпрамянення. З Э. *Фермі* сфармуляваў законы *квантавай статыстыкі* (статыстыка Фермі — Дзірака). У 1928 развіў рэлятывісцкую тэорыю руху электрона, на аснове якой прадказаў існаванне пазітрона. Займаецца праблемамі фіз. вакууму. Нобелеўская прэмія 1933.

Тв.: Рус. пер.— Электроны и вакуум, М., 1957; Принципы квантовой механики, М., 1960; Лекции по квантовой механике, М., 1968; Лекции по квантовой теории поля, М., 1971.

ДЗІРАНОК Яўхім Дзмітрыевіч [н. 25.12.1912 (7.1.1913), в. Неглюбка Суражскага пав. Чарнігаўскай губ.], беларускі савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1966), праф. (1967). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1939). У 1930—35 працаваў на шахце ў Луганскай вобл. З ліст. 1939 у Сав. Арміі. Удзельнік Айч. вайны. З 1946 ст. выкладчык і заг. кафедры ў Гомельскім пед. ін-це, з 1951 сакратар Гомельскага гаркома КПБ, з 1955 заг. кафедры ў Бел. ін-це інжынераў чыг. транспарту. Аўтар прац па гісторыі рэвалюц. руху на Палессі.

Тв.: Деятельность большевиков Гомельщины в период первой русской революции (1905—1907 гг.), Мн., 1955; Большевики Гомельщины в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции, Мн., 1957; Полесская организация большевиков в борьбе против царизма (1903 — март 1917 гг.), Мн., 1965.

ДЗІРВАН, *дзёран*, верхні слой глебы, што густа парос травою, пераплецены яе карэннем. Калі карэнішча перагнівае, утвараецца слой глебы, багаты на пажыўныя рэчывы. Дзірваном абкладаюць схілы насыпаў пры будаўніцтве дарог, тэрас, пры ўтварэнні зялёных бардзюраў.

ДЗІРЫК Крыстан Янавіч [23.10(4.11).1882, Шведгофская вол. Курляндскай губ.— 24.7. 1957], удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў на Беларусі. З рамеснікаў. Чл. КПСС з 1904. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07. За рэвалюц. дзейнасць тройчы быў арыштаваны. Напярэдадні і ў час 1-й сусв. вайны супрацоўнічаў у нелегальным бальшавіцкім друку, вёў агітацыю супраць імперыял. вайны. З 1915 у Віцебску, адзін са стваральнікаў латышскай бальшавіцкай арг-цыі, у 1917 нам. старшыні Латышскага ваеннага камітэта РСДРП(б) Віцебска, удзельнік стварэння Віцебскай арг-цыі РСДРП(б), атрадаў Чырв. гвардыі. З 1918 на парт. і сав. рабоце ў Арле, Крыме, Уладзіміры, Іванава-Вазнясенску. З кастр. 1930 чл. Партколегіі ЦКК — РСІ, з сак. 1934 да снеж. 1938 у апараце Камісіі парт. кантролю ЦК ВКП(б). Працаваў у Музеі Рэвалюцыі ў Маскве. На XIV—XVI з'ездах ВКП(б) выбіраўся чл. ЦКК. Аўтар успамінаў «Незабыўны час...» (у кн.: В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте, Мн., 1957), паэтычных твораў (псеўд. Шалконіс).



ДЗІСЕНСКАЯ НІЗІНА, на ПнЗ Віцебскай вобл., частка Полацкай нізіны. Утварылася ў браслаўска-невельскую стадыю Валдайскага абледзянення. Плоска-ўвагнутая паверхня з абс. адзнакамі 140—160 *м*. Складзена з азёрна-ледавіковых, пераважна стужкавых, пясчана-гліністых адкладаў. Дзісна — асн. рака, якая дрэнажуе Дз. н. і цячэ пасярод яе. У верхнім і сярэднім цячэнні рака ўрэзана слаба, толькі ніжэй Шаркоўшчыны ўтварае глыбокую тэрасаваную даліну, якая ўдаецца ў слаі стужкавых глінаў. Асн. прытокі Дзісны: Дрысвята, Янка (злева), Бірвета з Мядзелкай, Галбіца, Бярозаўка, Мнюта, Авута (справа). Сярод лясоў і балотаў шмат астатковых азёраў: Ельня, Асвята, Плоскае, Белае, Богінскае. Глебы дзярнова-слабаападзоленыя з рознай ступенню аглеення і забалочанасці; на стужкавых глінах (каля Шаркоўшчыны) вызначаюцца ўрадлівасцю. На У і З Дз. н. вялікія забалочаныя лясныя масівы (лясістасць каля 50%). Пераважаюць мяшаныя лясы з хвояй, драбналістымі пародамі і елкаю, трапляецца алешнік; балоты пераходныя і вярховыя. На літоўскай частцы Дз. н. даследавана радовішча гліны, на базе якога ў 9-й пяцігодцы будзе пабудаваны Ігналінскі завод дрэнажных трубаў. *В. П. Якушка.* Мінск.

ДЗІСНА (у Літоўскай ССР Дзісна й), рака, левы прыток Зах. Дзвіны. Даўж. 178 *км*. Пачынаецца на выш. 145,5 *м* над узр. м. з воз. Дзіснай у Ігналінскім р-не Літ. ССР. На тэр. БССР цячэ ў Віцебскай вобл. на працягу 149 *км*, з іх па мяжы з Літ. ССР 48 *км*. Вадазбор (8180 *км*²) пераважна на Дзісенскай нізіне, на схілах Браслаўскай грады і Свянцянскіх градаў, складзены азёрна-ледавіковымі, пераважна лентачнымі, пясчана-гліністымі адкладамі, ледавіковымі валуннымі суглінкамі, канцова-марэннымі адкладамі (валунны суглінак, супесак). У верхнім цячэнні шыр. даліны 70—200 *м*, рэчышча 10—15 *м*. У сярэднім цячэнні цячэ па шырокай даліне, перарэзанай меліярац. каналамі. Ніжняе цячэнне ў вузкай даліне (шыр. да 200 *м*), вышыня берагоў на 10—15 *м* над меланным гарызонтам вады; шыр. рэчышча 60—125 *м*. Урэз вады каля Каянаў 124 *м*, у вусці 106 *м* над узр. м. Лясістасць вадазбору каля 25%, азёрнасць 4%. Найб. азёры: Дзіснай, Дрысвяты, Богінскае. Найб. прытокі: Бірвета, Галбіца, Бярозаўка, Мнюта, Авута (справа), Дрысвята, Янка (злева). Жыўленне мяшанае: снегавое, дажджавое, грунтавое. Ледастаў з сярэдзіны снеж. да пач. крас. Вада ў разводдзе каля вусця паднімаецца на 458 *см*, найбольш на 758 *см* (1931). Сярэдні гадавы расход вады каля вусця 82 *м*³/*сек*. Сцёк завіслых часцінак за год каля Шаркоўшчыны 12 тыс. *т*. На Дзісне г. п. Шаркоўшчына, г. Дзісна. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі, лесасплаве.

Я. А. Якубоўскі. Мінск.

ДЗІСНА (Дзісна), горад у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. пры ўпадзенні р. Дзісны ў Зах. Дзвіну. За 45 *км* на У ад Міёраў, 145 *км* ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Боркавічы. 9,2 тыс. ж. (1969).



Дзісна. Школа-інтэрнат.

Назва ад р. Дзісны (Дзясны). Паводле звестак гісторыка І. Дз. Вяллева, засн. полацкімі крывічамі ў 11 ст. Да 15 ст. пасялішча ў складзе Вял. кн. Літ. У 1569—1776 і з 1790 горад меў магдэбургскае права і герб. У 1-й пал. 17 ст. ў Дз. існавала 3 праваслаўныя царк. брацтвы, 7 цэхаў рамеснікаў. У рус.-польскую вайну 1654—67 жыхары дабравольна здалі горад рус. войскам (25.7.1654). У Паўн. вайну 1700—21 разбураны. З 1793 у складзе Рас. імперыі, з 1795 цэнтр павета Мінскай, з 1842 Віленскай губ. Паводле перапісу 1897 у Дз. 6,7 тыс. ж. У рэв. 1905—07 тут дзейнічала група РСДРП, звязаная з Дзвінскім к-там РСДРП. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У люг.— снеж. 1918 Дз. акупавана ням. войскамі, у 1919 войскамі бурж. Польшчы. У маі 1920 вызвалена Чырв. Арміяй. У 1921—39 у складзе бурж. Польшчы, цэнтр павета Віленскага ваяводства. З 1940 раённы цэнтр Вілейскай, з 1944 — Полацкай, з 1954 Маладзечанскай вобл., з 1959 у Міёрскім р-не, з 1960 у Віцебскай вобл. У 1940 у Дз. было 6073 ж. У Айч. вайну акупавана нямец.-фаш. захопнікамі (ліп. 1941— 30.6.1944) і разбурана. Акупанты загубілі ў Дз. каля 4 тыс. чал. Пасля вайны горад адноўлены.

Камбінат буд. м., масласырзавод, пладоваагародніны з-д, участак Міёрскага камбіната быт. абслугоўвання, лясгас. Сярэдняя і васьмігадовая школы, школа-інтэрнат, школа рабочай моладзі, Дом піянераў і школьнікаў, дзіцячыя яслі і сад, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца. Помнікі: У. І. Леніну, сав. воінам і партызанам і 4 брацкія магілы сав. воінаў, партызанаў, жыхароў горада і навакольных вёсак, якія загінулі ў Айч. вайну.

Літ.: Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии, Витебск, 1896; Hedemann O. Dzisna i Druja. Magdeburskie miasta, Wilno, 1934.

Я. М. Карпачоў. Мінск; *З. С. Стаўэвіч.* Дзісна.

ДЗІТВА, рака, правы прыток Нёмана. Даўж. 93 *км*, у межах БССР каля 90 *км*. Пачынаецца з невялікага балота ў Эйтышкскім р-не Літ. ССР, цячэ ў Воранаўскім і Лідскім р-нах Гродзенскай вобл. Вадазбор (1220 *км*²) пераважна ў межах Лідскай раўніны; у нізоўі — на Нёманскай нізіне; забалочанасць каля 20%. Шыр. даліны да ўпадзення р. Крупкі 1—2,5 *км*, ніжэй 0,6—1,1 *км*. Схілы спадзістыя, нізкія, часам выш. да 10—14 *м*. Шырыня рэчкі 15—30 *м*. Гал. прытокі справа — Радунька, Чарняўка, злева — Крупка, Лідзея. Ледастаў з сярэдзіны снеж. да канца сак. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 7,8 *м*³/*сек*. Каля в. Купеніца плаціна.

ДЗІТРЫКІ, вёска ў Ганчарскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл., каля р. Нёман (3 *км*). Цэнтр калгаса імя Манькоўскіх. За 25 *км* на ПдУ ад Ліды, 157 *км* ад Гродна, 3 *км* ад чыг. ст. Нёман, каля шашы Ліда — Слонім (1,5 *км*). 159 ж., гасп. 63 (1971). Пач. школа, магазін.

ДЗІЎНАЯ, вёска ў Лужкоўскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл., на р. Мнюта. Цэнтр саўгаса «Гарадзец». За 33 *км* на У ад Шаркоўшчыны, 233 *км* ад Віцебска, 32 *км* ад чыг. ст. Падсвілле, каля шашы Глыбокае — г. п. Дзісна (0,5 *км*). 653 ж., дварой 189 (1971). Спірт. з-д. Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі і сад, сталовая, магазін. Помнік 49 землякам, 2 помнікі 21 савецкаму воіну і партызану, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗІЦЯЧАЕ КІНО, мастацкія, хранікальна-дакументальныя і мультыплікацыйныя фільмы для дзяцей. Адзін са сродкаў камуніст. выхавання, маст. і культ. развіцця дзяцей. Як спец. галіна кінамастацтва вылучылася пасля Кастр. рэвалюцыі. Спецыфіка Дз. к. абумоўлена псіхалогіяй і інтарэсамі дзяцей.

Вядомыя сав. фільмы: «Чырвоныя чарцяняты» (1923), «Падраныя чаравікі» (1933), «Бялее ветразь адзінокі» (1937), «Цімур і яго каманда» (1940), «Жыла-была дзяўчынка» (1944), «Сын палка» (1946), «Чук і Гек» (1953), «Няўлоўныя мсціўцы» (1967), «Увага, чарапаха!» (1970) і інш. На Беларусі ў канцы 20-х — у 30-я г. створаны дзіцячыя маст. фільмы «Грышка-свінапас» (1928, рэж.-мантажор В. Кубліцкі), «Адбітак часу» (рэж. Г. Кроль) і «Баям насустрач» (Э. Аршанскі) у 1932, «Палескія рабінзоны» (1935, І. Бахар і П. Малчанаў), «Канцэрт Бетховена» (1937, М. Гаўронскі і У. Шмітгоф); мультыплікац. «Выпадак на граніцы» (1930), дакумент. «Юныя вынаходнікі» (1931). З 1952 выходзіць кіначасопіс «Піянер Беларусі». Пасля вайны ў Дз. к. працуюць рэжысёры У. Голуб («Міколка-паравоз», 1957; «Дзяўчынка шукае бацьку», 1959; «Паланез Агінскага», 1971; і інш.), У. Бычкоў («Увага! У горадзе чараўнікі», 1964; «Горад майстроў», 1966), І. Дабралюбаў («Іван Макаравіч», 1968), В. Пяроў («Мы з Вулканам», 1970).

А. В. Красінскі. Мінск.



Кадр з дзіцячага кінафільма «Міколка-паравоз». «Беларусьфільм». 1957.

ДЗІЦЯЧА-ЮНАЦКІЯ СПАРТЫЎНЫЯ ШКОЛЫ (ДзЮСШ), пазашкольныя спартыўныя ўстановы, якія вядуць работу сярод дзяцей і падлеткаў па адным (спецыялізаваным) ці некалькіх (комплексных) відах спорту. Асн. задача ДзЮСШ — усебаковае выхаванне моладзі і падрыхтоўка кваліфікаваных спартсменаў. На Беларусі (1970) 189 ДзЮСШ, дзе займаецца каля 55 600 чал. па 33 відах спорту, у т. л. 14 спецыялізаваных школ, дзе зай-

маюцца футболам, веславаннем, спарт. гімнастыкай, плаваннем, веласіпедным і інш. відамі спорту.

ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА, творы мастацкай літаратуры для дзяцей. Адрозніваюць: творы для дзяцей дашкольнага ўзросту, малодшага, сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. У шырокім сэнсе Дз. л. ўключае і многія творы сусв. класікі, якія напісаны для дарослых і ўвайшлі ў кола дзіцячага чытання («Рабінзон Круза» Д. Дэфо, «Падарожжа Гулівера» Дж. Свіфта, «Спартак» Р. Джаваньёлі, «Хаціна дзядзькі Тома» Г. Бічэр-Стоў, раманы Ж. Верна, «Авадзень» Э. Войніч), а таксама казкі (А. Пушкіна, Ш. Перо, братоў Я. і В. Грым, Х. Андэрсена і інш.), творы нар. эпасу (*«Слова аб палку Ігаравым»*, *«Сасунцы Давід»* і інш.). Папулярнасцю сярод дзяцей карыстаюцца раманы «Чапаеў» Дз. Фурманава, «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага і інш., з бел. л-ры — «Сымон-музыка» і «Новая зямля» Я. Коласа, «Салавей» З. Бядулі і інш.



Супервокладка кнігі «Арляняты» (Мінск, 1967; маст. Б. Забораў).

Першай дзіцячай кнігаю лічыцца «Свет пачуццёвых рэчаў у малюнках» чэш. педагога Яна Амоса Каменскага (1658). У Расіі Дз. л. ўзнікла ў 18 ст. Найб. значныя творы 19 — пач. 20 ст.— байкі І. Крылова, «Канёк-Гарбунок» П. Яршова, многія творы М. Лермантава, М. Някрасава, М. Гогаля, У. Караленкі, А. Чэхава, Л. Талстога. За гады Сав. улады ў СССР створана багатая Дз. л. Яна цесна звязана з задачамі камуніст. выхавання, праслаўлена ідэямі патрыятызму, сацыялізм. гуманізму, дружбы паміж народамі. Вял. роля як арганізатара і тэарэтыка сав. Дз. л. М. Горкага. Для развіцця сав. Дз. л. шмат зрабілі П. Бажоў, А. Барто, В. Біянкі, А. Гайдар, Б. Жыткоў, Л. Касіль, В. Катаеў, С. Маршак, У. Маякоўскі, С. Міхалкоў, А. Талстой, К. Чукоўскі, а таксама Ф. Вігдарава, М. Носаў, М. Прыляжаева, Р. Фраерман, Ю. Якаўлеў і інш. У капіталіст. краінах заахвочваюцца творы, што нясуць ідэі чалавеканенавісніцтва, дух уласніцтва і жорсткасці, распаўсюджваецца пікапробная дэтэктыўная л-ра. Ім процістаяць гуманіст. творы прагрэс. дзіцячых пісьменнікаў. Папулярныя ва ўсім свеце творы для дзяцей італьян. пісьменніка Дж. Радары, польск. педагога Я. Корчака. У 20 ст. ў многіх краінах выдадзены ілюстраваныя энцыклапедыі для дзяцей.

Бел. Дз. л. развіваецца з пач. 20 ст. (у 19 ст. паасобныя вершы для дзяцей напісалі Ф. Багушэвіч, Я. Лучына, А. Гурыновіч). «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906) Цёткі і «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909) Я. Коласа вызначылі вялікі крок у развіцці Дз. л. Творы для дзяцей друкаваліся ў час. *«Лучынка»*. Пісьменнікі-асветнікі Я. Колас і Цётка выхоўвалі дзяцей на суровай праўдзе жыцця, рэаліст. паказе вёскі, працы, побыту сялянства, вучылі адчуваць і любіць прыроду. Вершы і паэмы Я. Купалы, што ўвайшлі ў дзіцячае чытанне («Курган», «Бандароўна»), раскрываюць паняцце радзімы і народа, знаёмяць з песнямі і легендамі роднага краю. Фальк. матывы — у аснове паэмы для дзяцей «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык» М. Багдановіча. Тэма абязволенага дзяцінства гучыць у ранніх апавяданнях Бядулі («Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі»), у вершах К. Буйло, Я. Журбы. Дэмакратызм, народнасць, вера ў вял. духоўныя магчымасці дзіцяці — асн. якасці найлепшых дакастрычніцкіх твораў.

Я. Купала, Я. Колас і Бядуля залажылі асновы бел. сав. Дз. л. Яе развіццё становіцца важнай дзярж. справаю. Выходзяць дзіцячыя час. *«Зоркі»* (1921—22), *«Беларускі піянер»* (1924—29), у Зах. Беларусі час. *«Заранка»* (1926—31); у 1933 ствараецца секцыя дзіцячай л-ры ССПБ. Гуманіст. пафас бел. Дз. л., сувязь яе з сав. рэчаіснасцю яркa выявіліся ў 20—30-я г. Дз. л. расшыраецца тэматычна (Кастрычнік і грамадз. вайна, шчаслівае сав. дзяцінства, піянерскае жыццё, вучоба і падарожжы, жыццё калан. народаў), жанрава — паяўляюцца паэмы («Шчаслівая дарога» А. Александровіча; паэтычнасцю, нац. каларытам вылучаюцца «Міхасёвы прыгоды» Я. Коласа), аповесці, п'есы, раманы. Найб. інтэнсіўна развіваецца проза (апавяданні і аповесці Я. Коласа, Бядулі, Я. Маўра, К. Чорнага, М. Паслядовіча, Л. Чарняўскай і інш., аповесці «Міколка-паравоз» М. Лынькова, «Насцечка» Чорнага, «Санька-сігналіст» В. Каваля, «Петрык-завадатар» Хв. Шыклера, «Пастка» С. Баранавых, аповесць-казка «Сярэбраная табакерка» Бядулі, казкі — «Рак-вусач» Я. Коласа, «Музыка-чарадзейнік», «Залатое дно» У. Дубоўкі, «Каваль-Вярцідуб» А. Якімовіча). Імкненне да эпічнасці спалучаецца з паглыбленнем ва ўнутр. свет героя, у яго псіхалогію (стварэнне Лыньковым жывога, непаўторнага характару дзіцяці — Міколкі-паравоза і інш.). У развіцці л-ры для дзяцей і юнацтва асаблівая роля Маўра, заснавальніка навук.-прыгодніцкага жанру (аповесці «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «ТВТ», «Палескія рабінзоны», раман «Амок»). Шмат зрабіў для бел. Дз. л. Якімовіч (апавяданні, казкі, аповесці). У паэзіі для дзяцей працавалі таксама Журба, П. Трус, А. Ушакоў і інш. Лынькоў напісаў казачную аповесць на тэму

Беларускія дзіцячыя пісьменнікі (злева направа) Т. Цулукідзе, Э. Агняцвет, Я. Маўр, Я. Бяганская на сустрэчы з юнымі чытачамі. 1966.



грамадз. вайны («Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў»), В. Вольскі па нар. матывах стварыў п'есы «Дзед і жораў» і «Цудоўная дудка». У Айч. вайну апавяданні пра дзяцей («Маленькая жанчына», «Матчына кроў» Чорнага; «Васількі», «Дзіцячы башмачок» Лынькова) — суровае абвінавачанне фашысцкіх забойцаў. Тэма партыз. барацьбы ў паэме-казцы «Прыгоды дзеда Міхеда» А. Астрэйкі. У 40—60-я г. актыўна працуюць у Дз. л. М. Танк, Я. Брыль, П. Глебка, В. Вітка, Э. Агняцвет, А. Чарнышэвіч, Дубоўка, С. Шушкевіч, П. Кавалёў, А. Пальчэўскі, А. Вялюгін, В. Хомчанка, А. Васілевіч, Я. Бяганская, І. Грамовіч, Н. Гілевіч, У. Краўчанка, Т. Хадкевіч, М. Лупсякоў, А. Шашкоў, І. Муравейка і інш. Шырока распрацоўваецца тэма Айч. вайны (творы саміх дзяцей — «Ніколі не забудзем», 1948, 3 выд. 1970, і інш.; паэмы «Ідзі, мой сын» А. Бялевіча, «Алёнчына школа» К. Кірэенкі, «Песня пра піянерскі сцяг» Агняцвет, «Насустрач жыццю» М. Калачынскага; аповесці «Андрэйка» Кавалёва, «Чорны снег» У. Шахаўца; апавяданні). Папаўняецца бел. Ленініяна (паэма Вялюгіна «Вецер з Волгі», творы Хомчанкі, П. Ткачова і інш.). Паяўляюцца біяграфічныя (пра Я. Купалу — «Ой, рана на Івана» З. Бандарынай, пра Я. Коласа — «Ад роднае зямлі...» С. Александровіча), навук.-фантаст. творы, нарысы Вольскага аб прыродзе Беларусі. Фальк. традыцыю ў Дз. л. ўзбагачаюць Вітка («Вавёрчына гора», «Буслінае лета»), Дубоўка («Мілавіца», «Хто дужэйшы», «Кветкі — сонцавы дзеткі»), Танк («Казка пра музыку», «Казка пра мядзведзя», «Ехаў Бай»), М. Лужанін («Хто робіць пагоду»), Я. Пушча («На Бабрыцы»), Калачынскі («Прыгоды Патапкі»); плённая дзейнасць Якімовіча па апрацоўцы нар. казак (аб. «Каток — залаты лабок» і «Бацькаў дар»). Маральна-этычныя тэмы ў творах І. Навуменкі («Вайна каля Цітавай копанкі»), Васілевіч («Расці, Ганька!» і «Доля цябе знойдзе»), А. Рылько («Мядовыя краскі»), Брыль, Бяганскай, Хв. Жычкі, В. Гарбука, А. Лойкі, Р. Барадуліна, Е. Лось, Д. Бічэль-Загнетавай і інш.; тэма мінулага — у аповесцях «Адкуль ліха на свеце», «Канец сервітуту» і «Кастусь Каліноўскі» Якімовіча. Развіваецца таксама дзіцячая паэма («Уражыстая песня» Кірэенкі, «Наш музей» П. Броўкі, «Незвычайныя канікулы» Агняцвет, «Лагерныя прыгоды Петрыка» Гілевіча). Для дзяцей сярэдняга ўзросту пішуць С. Грахоўскі, У. Корбан, для малодшага — А. Вольскі, А. Пысін, В. Зуёнак, М. Арочка. Выдаюцца дзіцячыя час. *«Вяровка»* і *«Вясёлка»*. На бел. мову перакладаюцца творы для дзяцей з рус., укр., літ., франц., польскай, ням., англ. і інш. моў.

Тэ.: Арляняцам. Анталогія беларускай савецкай дзіцячай літаратуры, т. 1—2, Мн., 1967; Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры, Мн., 1966.

Літ.: Горький М. О детской литературе, М., 1958; Макаренко А. С. О детской литературе и детском чтении, М., 1955; Беларуская дзіцячая літаратура, Мн., 1966; Гурэвіч Э. С. Беларуская дзіцячая літаратура, (1917—1967), Мн., 1970; Дзіцячая літаратура. Рэкамендацыйны паказальнік літ. (1945—1960 гг.), Мн., 1961; Дзіцячая літаратура БССР. Рэкамендацыйны паказальнік літ. 1961—1965, Мн., 1967.

М. М. Барсток. Мінск.

ДЗІЦЯЧАЯ ПСІХАЛОГІЯ, галіна псіхалогіі, якая вывучае факты і заканамернасці псіхічнага развіцця дзіцяці. Яе задача — пазнанне ўзроставых і індывідуальных псіхалагічных асаблівасцей дзяцей, раскрыццё працэсу станаўлення асобы. У. І. Ленін лічыў гісторыю разумовага развіцця дзіцяці адной з тых галін ведаў, з якіх павінна складацца тэорыя пазнання і дыялектыка (Тв., т. 38, с. 342).


Прыродазнаўчанавук. аснова сав. Дз. п.— вучэнне І. П. Паўлава пра вышэйшую нервовую дзейнасць. Дз. п. даследуе крыніцы і ўмовы развіцця асобных псіхічных працэсаў (пазнавальных, эмацыянальных, валявых), якасцей асобы (інтарэсаў, здольнасцей, характару, тэмпераменту) і відаў дзіцячай дзейнасці (гульні, праца, навучанне). Раскрывае асаблівасці авалодвання дзецьмі каштоўнасцямі грамадска-гістар. развіцця: моваю, маральнымі нормамі і інш. Цесна звязаная з *педагагічнай псіхалогіяй*, вызначае шляхі і метады працэсу выхавання і навучання дзяцей, іх магчымасці засваення ведаў, рэакцыі на выхаваўчыя ўздзеянні. Вывучае асаблівасці міжасабовых адносін у дзіцячых групах і калектывах. Прыроджаная здольнасць дзіцяці стварае неабходныя перадумовы для псіхічнага развіцця, але вырашальная роля ў фарміраванні дзіцячай псіхікі належыць умовам жыцця і выхавання. Асн. этапы псіхічнага развіцця: маленства (ад нараджэння да 1 г.), ранні дзіцячы ўзрост (ад 1 да 3 г.), дашкольны ўзрост (ад 3 да 7 г.), малодшы школьны ўзрост (ад 7 да 11—12 г.), падлеткавы ўзрост (ад 11—12 да 14—15 г.), ранні юнацкі ўзрост (ад 14—15 да 17—18 г.).

Літ.: Ушинский К. Д. Человек как предмет воспитания. Собр. соч., т. 8—9, М.— Л., 1950; Выготский Л. С. Развитие высших психических функций, М., 1960; Люблинская А. А. Очерки психического развития ребенка, 2 изд., М., 1965; Ковалев А. Г. Психология личности, 3 изд., М., 1970.


В. М. Кавалёў. Мінск.

ДЗІЦЯЧАЯ ТВОРЧАСЦЬ, шлях пазнання дзецьмі навакольнага свету, сродак усебаковага і гарманічнага іх развіцця. У працэсе творчасці дзіця развіваецца інтэлектуальна і эмацыянальна, вызначае свае адносіны да жыцця і сваё месца ў ім, набывае вопыт калектыўнага ўзаемадзеяння, удасканальвае навыкі работы з рознымі інструментамі і матэрыяламі, уменне валодаць целам, голасам, мовай і інш. Дзеці займаюцца пераважна ў пазашкольных дзіцячых установах пры Палацах і Дамах піянераў і школьнікаў, станцыях юных тэхнікаў і натуралістаў, дзіцячых чыгунках, сектарах Дамоў культуры прафсаюзаў і інш.

Тэхнічная дзіцячая творчасць. Вылучляецца ў канструяванні мадэляў, механізмаў, нескладаных машын, прылад і інш. і з'яўляецца сродкам політэхн. адукацыі і прафес. арыентацыі вучняў. Заняткі ў гуртках садзейнічаюць узнікненню і фарміраванню цікавасці да тэхнікі, развіваюць тэхн. мысленне, рацыяналізатарскія і вынаходніцкія схільнасці, даюць магчымасць глыбей вывучыць фізіку, матэматыку, чарчэнне, знаёмяць з прамысловасцю і с. гасп., дасягненнямі навукі і тэхнікі, фарміруюць у дзяцей працоўныя навыкі. Сістэма гурткоў, у якіх займаюцца дзеці, змест іх работы вызначаюцца ўзроставымі асаблівасцямі і ўзроўнем падрыхтоўкі школьнікаў. Дзеці малодшага школьнага ўзросту займаюцца ў гуртках агульнатэхнічнага мадэлявання (робяць папяровыя і кардонныя караблі, аўтамабілі, самалёты, потым выкарыстоўваюць дрэва, метал, пластмасы, гумавыя і эл. рухавікі). Вучні сярэдняга школьнага ўзросту займаюцца ў гуртках авіямадэльным, суднамадэльным, ракетнай тэхнікі, аўтаматыкі; вучні старэйшага ўзросту — у гуртках фізіка-тэхн.,







Ракета «Саюз». Гурток ракетнага мадэлявання Мінскага Палаца піянераў і школьнікаў (злева). «Месяцаход». Гурток мадэлявання Мінскага Палаца піянераў і школьнікаў (уверсе справа). Сухагрузнае судна «Мінск». Саша Замяроўскі, 15 гадоў. Мінская станцыя юных тэхнікаў.

радыёэлектронікі, кібернетыкі, аўтаматыкі, выліч. тэхнікі і інш. Канструюць мініяцюрныя цеплавыя, гідраўлічныя, ветраныя і геліяэлектрастанцыі, спартыўныя мікралітражныя аўтамабілі, мікрацыклеты, аэрасані, планёры, самалёты і інш. У сельскай мясцовасці навучэнцы ствараюць малую с.-г. тэхніку для навуч.-доследных участкаў (мікратрактары, культыватары, серыі навясных і прычапных с.-г. прылад). Асн. сав. часопісы па дзіцячай тэхн. творчасці: «Моделист-конструктор» (з 1966), «Юный техник» (з 1957).

Выяўленчая і прыкладная дзіцячая творчасць. Ажыццяўляецца ў розных галінах выяўл. мастацтва. Фарміруе творчую здольнасць дзяцей, іх назіральнасць, уяўленне, вобразнае мысленне, эстэтычны густ, садзейнічае ўсебаковаму развіццю дзіцяці. У выяўл. студыях, гуртках Палацаў і Дамоў піянераў і школьнікаў дзеці рысуюць, лепяць, займаюцца лінагравюрай, скульптурай і інш. Найб. пашыраны рысунак, ткацтва, работа з саломкай, разьба па дрэве. Выкарыстоўваюцца прыродныя матэрыялы (карані, шышкі, кара, мох і інш.), арнаментыка. Малююць і лепяць з натуры, па ўяўленні, прыдумваюць узоры і дэкаратыўныя кампазіцыі. Аснова дзіцячай творчасці — навакольны свет. У сваю работу дзеці ўносяць непасрэднасць, эмацыянальнасць, імкненне пазнаць свет. Творчасць дзяцей абумоўлена іх узростам, агульным развіццём, аб'ёмам навыкаў. Іл. гл. на ўклейцы.

Развіццю дзіцячай творчасці ў нашай краіне надаецца вял. ўвага. Піянерскія і камсамольскія арг-цыі, ДТСААФ разам з органамі нар. асветы наладжваюць выстаўкі, спаборніцтвы, конкурсы і інш. мерапрыемствы, якія стымулююць дзіцячую творчасць. Вынікі работ паказваюцца на школьных, раённых, гарадскіх, абл., рэсп., усесаюзных выстаўках. Лепшыя работы бел. дзяцей дэманструюцца на міжнар. выстаўках. У БССР першая станцыя юных тэхнікаў засн. ў 1929. У 1971 у рэсп. было 29 станцый юных тэхнікаў. У 1970 у гуртках дзіцячай творчасці Мінскага Палаца піянераў і школьнікаў, 160 Палацах і Дамах піянераў і школьнікаў рэсп., 29 станцыях юных тэхнікаў, 111 дзіцячых сектарах Палацаў і Дамоў культуры прафсаюзаў займалася больш як 82,8 тыс. дзяцей.

Літ.: Дземіхаў М. і Бялько А. Цэнтральнай станцыі юных тэхнікаў — 40 гадоў, «Народная асвета», 1969, № 11; Усімі колерамі вясёлкі, Мн., 1966; Флерина Е. А. Изобразительное творчество детей дошкольного возраста, М., 1956; Разумовский В. Г. Развитие технического творчества учащихся, М., 1961; Лабунская Г. В. Учись рисовать, М., 1961; Я е ж. Изобразительное творчество детей, М., 1965; Столяров Ю. Юные конструкторы и техническое творчество, М., 1966; Чуковский К. И. От двух до пяти, 21 изд., М., 1970; Выготский Л. С. Воображение и творчество в детском возрасте, 2 изд., М., 1967.

Ю. С. Корчык. Мінск.

ДЗІЦЯЧЫ ДОМ, дзярж. выхаваўчая ўстанова ў СССР для дзяцей, якія страцілі бацькоў, і дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе дзяржавы (з прычыны хваробы бацькоў, пазбаўлення іх бацькоўскіх правоў і інш.). Дзеці-сіроты знаходзяцца на поўным забеспячэнні дзяржавы. Асн. тыпы Дз. д.— дашкольны (для дзяцей ад 3 да 7 г.) і школьны (ад 7 да 18 г., да заканчэння выхаванцамі сярэдняй школы). Усе выхаванцы школьнага ўзросту наведваюць школу. У 1945 у БССР было 245 Дз. д., у якіх выхоўвалася 26,9 тыс. дзяцей, у 1970 — 25 школьных (на 2693 выхаванцы) і 13 дашкольных (на 3 тыс. дзяцей) Дз. д.

У дарэвалюц. Расіі для дзяцей-сірот ствараліся дзіцячыя прытулкі і сіроцкія дамы, якія існавалі пераважна на сродкі дабрачынных і філантрапічных т-ваў. Пасля Кастр. рэвалюцыі прытулкі і сіроцкія дамы ператвораны ў Дз. д. У 1920—23 узніклі дзіцячыя калоніі і *школы-камуны.* Для дзяцей, бацькі якіх загінулі ў Вял. Айч. вайну, былі створаны спец. Дз. д. *В. П. Александроўская.* Мінск.

ДЗІЦЯЧЫ ПАКОЙ МІЛІЦЫІ, установа, якая вядзе выхаваўчую работу з дзецьмі і падлеткамі, што парушылі грамадскі парадак. Задачы і кампетэнцыя Дз. п. м. вызначаны на аснове пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб ліквідацыі дзіцячай беспрытульнасці і безнагляднасці» (1935). Ствараюцца раённымі і гарадскімі выканкомамі Саветаў дэпутатаў працоўных пры аддзелах унутраных спраў.

Работнікі Дз. п. м. затрымліваюць дзяцей і падлеткаў, якія парушаюць грамадскі парадак, высвятляюць умовы іх жыцця і прычыны благіх паводзін і разам з дзярж. органамі і грамадскасцю робяць захады, каб ажыццявіць кантроль за гэтымі дзецьмі, папярэдзіць безнагляднасць і правапарушэнні.

Літ.: Предупреждение правонарушений среди несовершеннолетних, Мн., 1969.

Ю. А. Кладухін. Мінск.

ДЗІЦЯЧЫ САД, дашкольная ўстанова ў СССР, у якой ажыццяўляецца выхаванне дзяцей ва ўзросце ад 3 да 7 гадоў. Задача Дз. с., як і *дзіцячых яслаў,*— забяспечыць грамад-






Дзіцячая творчасць I.

1. Саша Шыбнёў (6 гадоў). Касманаўты.
2. Сеня Ключ (12 гадоў). Зіма ў калгасе.
3. Саша Марозаў (14 гадоў). Хатынь.
4. Саша Длатоўскі (12 гадоў). На ваенны парад.
5. Віця Цімохін (10 гадоў). Украінскі танец. Усе рысункі знаходзяцца ў Мінскім Палацы піянераў і школьнікаў.

















Дзіцячая творчасць II. 1. Міша Міжны (11 гадоў). Магілёўскі вакзал. 2. Ларыса Дзятко (15 гадоў). Плошча Перамогі. Дыван. 3. Сярожа Аляксандраў (11 гадоў). Мальчыш-кібальчыш. 4. Таня Рабікава (11 гадоў). Касцёр. Дыван. 5. Валя Свізінская (11 гадоў), Ніна Аліферанка (11 гадоў), Таня Малашкевіч (10 гадоў) і Лена Гаціла (10 гадоў). Беларускі касцюм. Усё знаходзіцца ў Мінскім Палацы піянераў і школьнікаў.

скае выхаванне дзяцей, вызваліць жанчынумаці для ўдзелу ў гаспадарчай і культ. дзейнасці краіны. З 1959 існуе таксама дашкольная ўстанова, якая аб'яднала дзіцячыя яслі і Дз. с. ў адзін тып дашкольнай установы — *дзіцячыя яслі-сад*. Строгае выкананне рэжыму ў Дз. с., выхаваўча-адукацыйная работа садзейнічаюць правільнаму фізічнаму і разумоваму развіццю дзяцей. Дз. с. ажыццяўляюць агульную падрыхтоўку да школы і з'яўляюцца часткай сістэмы нар. адукацыі. Як тып дзіцячай установы існуюць у розных краінах (назвы бываюць розныя). У сацыяліст. краінах утрымліваюцца на дзярж. бюджэце, у капіталіст.— пераважна на прыватныя сродкі, на сродкі царквы, грамадскіх арг-цый. У БССР у 1970 у 751 Дз. с. і 1192 дзіцячых яслях-садах выхоўвалася 230,9 тыс. дзяцей. Гл. таксама *Дашкольнае выхаванне*.

Літ.: Детский сад. Книга для заведующих детскими садами, 2 изд., М., 1961; Демурова Е. Ю. и Островская Л. Ф. Для молодой заведующей детским садом, М., 1969. *Е. Г. Андрэева.* Мінск.

ДЗІЦЯЧЫ ТЭАТР, гл. *Тэатр для дзяцей*.

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР, розныя віды вуснай народнай паэзіі, створанай дарослымі для дзяцей, творы, што перайшлі з рэпертуару дарослых у разрад дзіцячых, творчасць саміх дзяцей.

У залежнасці ад функцыянальнай ролі творы Дз. ф. можна падзяліць на 3 групы: 1) Калыханкі — кароценькія песенькі простага зместу. Спяваюцца звычайна над калыскаю, знаёмяць дзіця з навакольным светам, расказваюць пра свойскіх жывёл, птушак, звяроў, пра іх учынкі і прыгоды, даюць бытавыя замалёўкі народнага жыцця. Вызначаюцца напеўнай мелодыкай у тэмпе і рытме калыхання, даступнасцю зместу, прастатой кампазіцыі, займальнасцю. Багацце рыфмаў — асаблівасць бел. калыханак. Яны — адзін з самых старажытных песенных жанраў. 2) Пацешкі, або забаўлянкі,— дзіцячыя гульні з лічылкамі, вершаванымі і празаічнымі прыгаворамі. Забаўлянкамі звычайна суправаджаюцца элементарныя рухі дзіцяці, прасценькія гульні з яго ручкамі, ножкамі, пальцамі. Выконваюцца часам і без гульні, калі трэба супакоіць або рассмяшыць малое. Забаўлянкі — пераважна вершаваныя шматрадкоўі з хуткім рытмам, жартаўліва-гумарыст. зместам, якія вымаўляюцца рачытатывам. Як і ў калыханках, у іх яскрава выяўляецца імправізацыя. Уласна гульні займаюць вял. месца ў жыцці дзіцяці. Бел. дзіцячыя гульні, як наогул гульні ўсх. славян, цесна звязаны з прац. дзейнасцю чалавека, з яго бытам і жыццём («Мак», «Рэпка», «У ворана», «Гусі», «Каршун» і інш.). Умоўна вылучаюцца гульні як мастацкадрам. дзеянне і гульні як сродак фіз. выхавання. Да першай, уласна фальклорнай, групы адносяцца гульні, у якіх абавязковыя пэўныя ўстойлівыя слоўныя прыгаворы («Гаралыш», «Кошкі-мышкі» і інш.), гульні з строгім размеркаваннем роляў кожнага ўдзельніка («Каршун», «Ваўкі і авечкі»), а таксама тыя, у якіх гульня спалучаецца з мелодыяй і словам (карагоды). Да гульнёвага фальклору належаць лічылкі — невялікія вершаваныя творы, найчасцей гумарыст. характару, з дапамогаю якіх вызначаецца чарговасць у гульні, выбіраюцца ле ўдзельнікі або вядучыя. Важную ролю ў лічылках мае рытм. 3) Творы не звязаныя з гульнямі: дзіцячыя песенькі (пра муху, камара, казу), дражнілкі, заклічкі, некат. загадкі і казкі (асабліва пра жывёл). Бел. Дз. ф. збіралі і вывучалі Я. Чачот, А. Рыпінскі, Ю. Крачкоўскі, П. Шэйн, Е. Раманаў, М. Нікіфароўскі, М. Федароўскі і інш.

Кр.: Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1 (ч. 1) — 3, СПб., 1887—1902; Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 1—2, Киев, 1886, в. 3, Витебск, 1887, в. 8, Вильна, 1912; Крачковский Ю. Очерки быта западнорусского крестьянина, у кн.: Виленский сборник, Вильна, 1869; Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии, [ч.] 4 — Игры и игроки, «Этнографическое обозрение», 1897, № 3; Демидович П. П. Белорусские детские игры, «Живая старина», 1898, № 3—4; Чарняўская Л. Дзіцячыя гульні, Вільня, 1919; Грыневіч А. Беларускі дзіцячы спеўнік..., Вільня, 1925; Сахараў С. П. Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў, в. 1, Рыга, 1940; Луцэвіч У. Народныя дзіцячыя песенькі, Мн., 1939; Ладачкі-ладкі. Беларускія народныя песенькі-баечкі, прымаўкі, пацешкі, Мн., 1949; Януковіч Л. [За ельнічкам, за бярэзнічкам], Мн., 1969; Беларускі фальклор. Хрэстаматыя, Мн., 1970; Federowski M. Lud białoruski, t. 2, Kraków, 1902.

Літ.: Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, М., 1916, с. 225—235; Гілевіч Н. С. Наша родная песня, Мн., 1968, с. 172—178. Капица О. И. Детский фольклор, Л., 1928; Аникин В. П. Русские народные пословицы, поговорки, загадки и детский фольклор, М., 1957. *Г. А. Барташэвіч.* Мінск.

ДЗІЦЯЧЫЯ ХВАРОБЫ, група хвароб, якія бываюць выключна або пераважна ў дзяцей. У нованароджаных (да 4—6 тыдняў) бываюць хваробы, звязаныя з родамі (траўмы, крывазліццё ў мозг, неданошанасць), і выяўляюцца асн. недахопы развіцця плода. Нованароджаныя асабліва адчувальныя да гнаяродная інфекцыі, пераахаладжэнняў, хварэюць на сепсіс і запаленне лёгкіх. У грудным узросце (гл. *Грудное дзіця*) бываюць расстройствы стрававання, часта з цяжкім таксікозам *(дыспепсія)*, запаленне лёгкіх. Пры інтэнсіўным росце могуць узнікнуць хваробы абмену рэчываў: *рахіт* (ад нястачы вітаміну Д), малакроўе (ад нястачы жалеза), *дыятэз* (ад павышанай адчувальнасці да некат. харчовых рэчываў). Дзеці да 7 г. пераважна хварэюць на вострыя дзіцячыя інфекцыі — *адзёр, коклюш, воспу ветраную, шкарлятыну, дыфтэрыю*. У дзяцей малодшага школьнага ўзросту (7—12 г.) бываюць гэтыя і інфекцыйна-алергічныя хваробы — *рэўматызм*, бранхіяльная астма, *нефрыты*. У сярэднім і старэйшым школьным узросце (12—17 гадоў) найчасцей расстройствы нервовай і сардэчна-сасудзістай сістэм, абвастрэнне туберкулёзу, рэўматызму, калі дзеці хварэлі на іх раней. Прафілактыка Дз. х.: папярэджванне родавых траўмаў, правільны рэжым яды і выхавання, прышчэпкі супраць туберкулёзу, воспы, адру, дыфтэрыі, фізкультура, спорт і загартоўванне арганізма.

Вывучэнне Дз. х. у Расіі пачалося з 18 ст. Першае дзіцячае адда. адкрыта ў 1806, дзіцячая бальніца ў 1834 (Пецярбург), у Мінску ў 1926. Дзяцей лячылі тэрапеўты, наглядалі за дзецьмі груднога ўзросту ўрачы-акушэры. У канцы 19 ст. вылучылася самастойная навука пра асаблівасці і хваробы дзіцячага арганізма — *педыятрыя*.

Літ.: Домбровская Ю. Ф. и Тур А. Ф. Педиатрия, у кн.: 50 лет советского здравоохранения. 1917—1967, М., 1967 (бібліягр.); Здравоохранение Белорусской ССР за сорок лет (1919—1958). Указатель литературы, Мн., 1961, с. 245—263; гл. таксама літ. пры арт. *Педыятрыя*.

І. Н. Усаў. Мінск.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЧАСОПІСЫ, перыядычныя выданні для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту.

Першы Дз. ч. у Расіі «Детское чтение для сердца и разума» (1785—89) выдаваўся М. І. *Навіковым*, меў асветны кірунак (у 18 і пач. 19 ст. нераз перавыдаваўся). У 1-й пал. 19 ст. выходзілі Дз. ч. рэліг.-манархічнага кірунку: «Новое детское чтение» (1821—24), «Новая детская библиотека» (1827—29, 1831) і інш. У 2-й пал. 19 і пач. 20 ст.

выходзілі Дз. ч. «Подснежник» (1858—62), «Детское чтение» (1869—1918; з 1906 «Юная Россия»). «Малк» (1909—18), «Всходы» (1896—1917), «Галчонок» (1911—13) і інш., якія друкавалі арт. па прыродазнаўчанавук. і гістар. тэмы, маст. творы.

Першы сав. час. для дзяцей «Северное сияние» (1919—20) засн. М. Горкім у Петраграде. Пасля стварэння піянерскай арг-цыі дзе. Пасля стварэння піянерскія час.: «Юные товарищи» (1922) выдаюцца піянерскія час.: «Юные товарищи» (1922), «Юные строители» (1923—25), «Барабан» (1923—26), «Пионер» (з 1924), «Юный натуралист» (з 1929), «Костер» (з 1936) і інш. Выходзяць спецыялізаваныя час. для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту: «Мурзілка» (з 1924), «Чиж» (1930—41), «Еж» (1928—35), «Затейник» (1929—41, 1946—53), «Юный художник» (1936—41), «Веселые картинки» (з 1956). З 1956 выдаецца час. «Юный техник» і інш. Дз. ч. выдаюцца таксама ва ўсіх саюзных і аўтаномных рэспубліках.

Да Кастр. рэвалюцыі на Беларусі выдаваўся час. *«Лучынка»* (Мінск, 1914, рэдагавала Цётка), разлічаны на дзяцей і юнацтва. У 1905—12 у Вільні выходзіў літ. час. для дзяцей старэйшага ўзросту «Зорька». У Зах. Беларусі: *«Заранка»* (1927—31), *«Снапок»* (1937), «Пралескі» (1934—38), «Зорка» (1938—39; клерыкальнага кірунку). У БССР у 1921—22 выходзіў дзіцячы час. *«Зоркі»*. ЦК ЛКСМ Беларусі і Рэсп. савет піянерскай арг-цыі імя Леніна выдаюць час. *«Бярозка»* (з 1924) і *«Вясёлка»* (з 1957).

Найбольш вядомыя замежныя дзіцячыя часопісы: Балгарыя — «Дружинка» («Звяно», з 1949), Венгрыя — «Ezermester» («Майстар на ўсе рукі», з 1957), ГДР — «Die ABC-Zeitung» («Буквар-газета», з 1946), Польшча — «Płomyczek» («Агеньчык», з 1916), Румынія — «Arici pogonici» («Вожык», з 1957), Чэхаславакія — «Ohníček» («Агеньчык», з 1951), Югаславія — «Poletarac» («Жаўтароты», з 1950). *А. Дз. Васілеўская, Л. І. Збрамеевіч.* Мінск.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЧЫГУНКІ, пазашкольныя ўстановы, якія памагаюць школе ў навуч.-выхаваўчай рабоце, садзейнічаюць развіццю тэхн. майстэрства і прафесійнай арыентацыі навучэнцаў.

Даўжыня чыгункі звычайна ад 1,5 да 10—12 км. Пры Дз. ч. — гурткі юных чыгуначнікаў з тэрмінам навучання 5 гадоў. Першыя Дз. ч. пабудаваны ў Тбілісі (1935) і Днепрапятроўску (1936). У СССР (1970) 34 Дз. ч., агульная іх даўжыня больш за 100 км. У Мінску Дз. ч. адкрыта ў 1955, даўж. 3 км 790 м; у 1970 у гуртках юных чыгуначнікаў займалася больш за 800 чал. *У. П. Чыж.* Мінск.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЯСЛІ, установа ў СССР, якая забяспечвае неабходныя ўмовы развіцця і выхавання дзяцей ва ўзросце ад 2 месяцаў да 3 гадоў. У яслях дзеці знаходзяцца па 10—11 гадзін у суткі пад наглядам урача і сярэдняга мед. персаналу; існуюць таксама групы падоўжанага (12—14 гадзін у суткі) і кругласутачнага абслугоўвання. Дзяцей, якім спаўняецца 3 гады, прымаюць *дзіцячыя сады*. У мэтах ажыццяўлення адзінай сістэмы выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту з 1959 ствараюцца аб'яднаныя дашкольныя ўстановы *дзіцячыя яслі-сады*. У 1970 у БССР было 390 Дз. я. на 28,9 тыс. дзяцей. Гл. таксама *Дашкольнае выхаванне*.

Літ.: Аксарина Н. М. Воспитание детей раннего возраста, М., 1969.

ДЗІЦЯЧЫЯ ЯСЛІ-САД, дашкольная ўстанова ў СССР для выхавання дзяцей ва ўзросце ад 2 месяцаў да 7 гадоў. Існуюць з 1959. Створаны ў выніку аб'яднання там, дзе былі мясцовыя магчымасці, двух тыпаў дзіцячых устаноў — *дзіцячых ясляў* і *дзіцячых садоў*. Будуюцца і новыя Дз. я.-с. Маюць на мэце забяспечыць адзіны пед. працэс выхавання і развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. З дзецьмі ранняга ўзросту працуюць сёстры-выхавальніцы, з дзецьмі ва ўзросце ад 2 да 7 гадоў — выхавальніцы з вышэйшай або сярэдняй пед. адукацыяй. Метадычную і выхаваўчую работу ажыццяўляе педагог-метадыст, лячэбна-прафілактычную — урач. Памяшканні Дз. я.-с. будуюцца паводле тыпавых праектаў на 140—280 месцаў у горадзе і 50—90 у вёсцы. У 1970 у БССР было 1192 Дз. я.-с. на 167,7 тыс. дзяцей. Гл. таксама *Дашкольнае выхаванне*.

ДЗІЧКА, маладое дрэва, якое вырошчваюць з насення на прышчэпу, ці самасейнае.

ДЗМІТРАВІЧЫ, вёска ў Бярэзінскім р-не Мінскай вобл., на р. Брусята. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дзмітравічы». За 22 км на ПнУ ад г. Беразіно, 125 км ад Мінска, 45 км ад чыг. ст. Бобр, на аўтамаб. дарозе Беразіно — г. п. Бобр. 527 ж., гасп. 173 (1971). Ляснічтва, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, аптэка, адд. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У ліст. 1942 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску, загубілі 32 мірных жыхароў. Помнікі на дзвюх брацкіх магілах сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЗМІТРАВІЧЫ, вёска ў Камянецкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Дзімітрова. За 10 км на Пн ад Камянца, 49 км ад Брэста, 40 км ад чыг. ст. Жабінка, на шашы Камянец — в. Камянюкі. 623 ж., дварой 211 (1971). Ляснічтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, адд. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік 112 сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЗМІТРАЎ Міхаіл Ціханавіч (н. 24.5.1926, с. Красны Флот Петрапаўлаўскага пав. Варонежскай губ.), бел. сав. спартсмен, майстар спорту СССР (1956) па парашутным спорце. Засл. трэнер РСФСР (1964). На Міжнар. спаборніцтвах у 1957 (г. Ціват, Югаславія) заваяваў Залаты медаль па скачках з парашутам у ваду. У 1958 (г. Браціслава, Чэхаславакія) чэмпіён свету ў камандным і 3-е месца ў асабістым заліку. Шматразовы рэкардсмен свету (1954, 1956, 1960). Працуе (1971) у Ін-це цепла- і масаабмену АН БССР.

ДЗМІТРЫЕВА Лізавета Лукінічна (сапр. Кушалёва, па мужу Туманоўская; каля 1851, с. Валок Холмскага пав. Пскоўскай губ.— 1898), руская рэвалюцыянерка, адна з стваральніц (1870) і чл. Рускай секцыі 1-га Інтэрнацыянала. З дварян. У снеж. 1870 наведала Лондан для справаздачы К. Марксу пра дзейнасць секцыі. У час Парыжскай камуны 1871 накіравана ў Парыж як прадстаўнік Ген. Савета 1-га Інтэрнацыянала і карэспандэнтка К. Маркса. Заснавала там жаночую ваен. лігу, якая вяла прапаганду, памагала раненым камунарам. На чале жаночага батальёна камунарак змагалася з версальцамі. Пасля паражэння Камуны жыла ў Жэневе, пазней вярнулася ў Расію.

Літ.: Перапіска К. Маркса і Ф. Энгельса з рускімі палітычнымі дзеячамі, Мн., 1954, с. 45—46, 48, 51; Книжник-Ветров И. Героиня Парижской коммуны 1871 г. Е. Л. Тумановская («Елизавета Дмитриева»), «Летописи марксизма», 1928, № 7—8; Шпадарук И. П. Русская секция I Интернационала и ее социологические воззрения, Мн., 1970.

ДЗМІТРЫЕЎ Андрэй Сяргеевіч (н. 29.6.1925, Ленінград), беларускі савецкі вучоны ў галіне фізіялогіі чалавека і жывёл. Д-р біял. н. (1970). Чл. КПСС з 1953. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Бел. ін-т фіз. культуры (1954). Вучоны сакратар (1957—60), нам. дырэктара па навук. рабоце (з 1960) і заг. лабараторыі спец. фізіялогіі (з 1970) Ін-та фізіялогіі АН БССР. Кірунак даследаванняў Д.— эксперым. вывучэнне асаблівасцей уплыву гравітацыйных фактараў на арганізм чалавека і жывёл, ролі лабірынтных і экстралабірынтных рэфлекторных і гумаральных кампанентаў у механізме рэакцый асобных органаў і структур цэнтр. нервовай сістэмы на гравітацыю. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Лабиринтные и экстралабиринтные механизмы некоторых соматических и вегетативных реакций на ускорение, Мн., 1969.

ДЗМІТРЫЕЎ Барыс Міхайлавіч (11.6.1924, Масква — 23.2.1944), удзельнік партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. ВЛКСМ. З служачых. Скончыў спецшколу і ў чэрв. 1942 накіраваны ў 211-ы партыз. атрад (Асіповіцкі р-н). Дыверсійныя групы на чале з Дз. падарвалі 18 ням. эшалонаў, 54 аўтамашыны, 11 танкаў, 12 гармат, 1400 рэек, 43 чыг. і шашэйныя масты. Загінуў у баі каля в. Каменічы Асіповіцкага р-на. Пахаваны ў Асіповічах. Пастаўлены помнік, яго імем названы вуліца і школа.



Літ.: Люди легенд, в. 1, М., 1965, с. 377—383.

ДЗМІТРЫЕЎ Мікалай Міхайлавіч [н. 6(19). 12.1917, с. Куман Оркскага пав. Арэнбургскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1941). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941, наводчык гарматы. Вызначыўся ў баях пад Оршай, 10.7. 1941 падбіў 3 варожыя танкі. Жыве ў Сараску.

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Аляксеевіч [1832, Пецярбург — 14(26).5.1873], даследчык беларускага фальклору і этнаграфіі. З мяшчан. Скончыў Галоўны пед. ін-т у Пецярбурзе. З 1853 настаўнік Навагрудскага дваранскага вуч., пазней дырэктар Навагрудскай гімназіі. У 1867—73 дырэктар Гродзенскай дырэкцыі нар. вучылішчаў. Запісваў бел. фальклор, даследаваў матэрыяльную культуру беларусаў. Знаходзячыся на ліберальна-асветніцкіх пазіцыях, спачуваў селяніну. Выдаў у Вільні «Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялян Паўночна-Заходняга краю» (1869), дзе змясціў песні (277), казкі (8), апісанні абрадаў, нар. гульняў, забаў, танцаў.

Тв.: Несколько слов краткого исторического обозрения русско-литовского Новогрудка..., «Вестник имп. Русского географического общества», 1858, ч. 24; Собрание дальнейших исторических сведений о Новогрудке со смерти Свенторога (1270), там жа, 1859, ч. 26; Опыт собрания песен и сказок крестьян Северо-Западного края, Гродно, 1868; Обряды и обычаи западнорусских крестьян, у кн.: Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 г., Гродно, 1869. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч (н. 23.9. 1921, в. Барсукі Рагачоўскага пав. Гомельскай губ.), Герой Сац. Працы (1971). Засл. настаўнік БССР (1964). Канд. пед. н. (1968). Чл. КПСС з 1946. Скончыў БДУ (1950). Удзельнік партыз. руху ў Гомельскай вобл. (1941—43). З 1936 настаўнік, у 1943—60 настаўнік, дырэктар сярэдняй школы, працаваў у органах нар. асветы. З 1961 дырэктар Кармянскай сярэдняй школы-інтэрната. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Славы 3-й ступені, медалямі.

ДЗМІТРЫЕЎ Рыгор Якаўлевіч (н. 21.1.1921, в. Багданаўка Томскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У ноч на 17.10.1943 на дэсантных лодках забяспечыў пераправу цераз Дняпро 2 стралк. батальёнаў. Жыве ў Сімферопалі.

ДЗМІТРЫЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч [31. 7(13.8).1900, Масква — 6.5.1948], рускі савецкі тэатр. мастак, жывапісец. Засл. дзеяч маст. РСФСР (1944). Вучыўся ў Петраградзе ў школе А. Званцавай (1916—17) і ў АМ (1918—21). Гал. мастак МХАТа (1941—48). Афарміў каля 150 спектакляў у тэатрах Масквы («Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага, 1932, у т-ры імя Вахтангава; «Ганна Карэніна» паводле Л. Талстога, 1937, «Тры сястры» А. Чэхава, 1940, «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна, 1942, МХАТ; «Пікавая дама» П. Чайкоўскага, 1931 і 1944, Вялікі т-р, і інш.), Ленінграда («Вайна і мір» С. Пракоф'ева, 1946, Малы оперны т-р, і інш.), Мінска («Рамэо і Джульета» У. Шэкспіра, 1946, і «За тых, хто ў моры!» Б. Лаўранёва, 1947, т-р імя Я. Купалы).

Літ.: Костина Е. М., Дмитриев, М., 1957.

ДЗМІТРЫЕЎСКІ САБОР у Уладзіміры, помнік уладзіміра-суздальскага дойлідства. Пабудаваны пры кн. Усеваладзе як цэнтр палацавага ансамбля (1194—97). У 1837—39 разбураны вонкавыя галерэі і дзве лесвічныя вежы. Рэканструяваны ў 1952. Белакаменны кубічны, 4-стаўповы, 3-апсідны ў плане храм завершаны светлавым барабанам і залочаным шламападобным купалам. Верт. чляненне фасадаў ствараецца высокімі калонкамі, якія прарэзвае аркатурны пояс. Да с. упікальны па колькасці выяў (566 разьбяных камянёў).

Раслінны арнамент перамяжаецца з выявамі на свецкія, міфалаг. і рэліг. тэмы. Часткова збераглісяфрэскі канца 12 ст. Гл. іл. ў арт. *Архітэктура.*

ДЗМІТРЫЙ ІВАНАВІЧ ДАНСКІ (12.10.1350—19.5.1389), князь маскоўскі з 1359 і вял. князь уладзімірскі з 1363, сын кн. *Івана II* Іванавіча Краснага. Змагаўся за цэнтралізацыю дзяржавы. Пры ім Масква замацавала кіруючае становішча ў рус. землях. У 1367 у Маскве пабудаваны першы ў Паўн.-Усх. Русі каменны крэмль. У 1368, 1370 і 1372 войскі Дз. І. Д. адбілі напады на Маскву вял. кн. літ. *Альгерда*, які выступаў з цвярскімі князямі супраць аб'яднання рус. княстваў. У 1376 Дз. І. Д. замацаваўся ў Балгарыі Волжска-Камскай. Першы з рус. князёў узначаліў барацьбу супраць татара-манголаў: у 1378 на р. Вожа перамог татарскае войска Бегіча, у *Кулікоўскай бітве* 1380 разбіў татарскія войскі, што дало пачатак вызваленню Русі ад татара-мангольскай няволі. За гэтую бітву празваны Данскім. Пасля нападу на Маскву хана Тахтамыша (1382) аднавіў горад. Упершыню без згоды Арды завяшчаў вял. княжанне сыну Васілю.

Літ.: Черепнин Л. В. Образование Русского централизованного государства в XIV—XV веках, М., 1960.

ДЗМІТРЭЎСКІ Іван Апанасавіч [28.2(11.3). 1734, Яраслаўль — 27.10(8.11).1821], рускі акцёр, рэжысёр, педагог, перакладчык, тэатр. дзеяч. Найб. значны прадстаўнік рус. сцэн. класіцызму. Чл. Расійскай акадэміі (1802). Пачлечнік Ф. Волкава па стварэнні т-ра ў Яраслаўлі. З 1756 у трупе першага рус. т-ра ў Пецярбурзе. Лепшыя ролі: Сінаў, Дзмітрый («Сінаў і Трувор», «Дзмітрый Самазванец» А. Сумарокава), Альцэст («Мізантроп» Мальера), Валер («Ігрок» Ж. Рэньяра), Усердаў («Усеагульнае апалчэнне» С. Віскаватава). Першы пастаноўшчык «Недаростка» Дз. Фанвізіна (1782) і выканаўца ролі Старадума. Напісаў «Гісторыю рус. т-ра» (рукапіс не збярогся).

Літ.: Всеволодский-Гернгросс В. Иван Афанасьевич Дмитревской, М.—Л., 1945.

ДЗЎКІ, адгалінаванне *аўкштайтаў*. Жывуць на ПдУ Літ. ССР (Дзукія). Ад інш. літоўцаў адрозніваюцца адметнымі дыялектнымі рысамі (у т. л. дзеканнем). У лексіцы Дз., ва ўзорах і каларыце адзення, у тканкім арнаменце, ядзе і інш. з'явах матэрыяльнай культуры і побыту шмат агульнага з беларусамі.

Літ.: Литовцы, у кн.: Народы Европейской части СССР, т. 2, М., 1964.

ДЗЬМУХАВЕЦ, тое, што *адуванчык*.

ДЗЬЮІ (Dewey) Джон (20.10.1859—2.4.1952), амерыканскі філосаф-ідэаліст і педагог. Распрацаваў новы варыянт прагматызму, які назваў *інструменталізмам*. Паводле Дз., адрозненні суб'екта і аб'екта, псіхічнага і фізічнага — гэта толькі адрозненні ўнутры «вопыту». Навук. паняцці, законы, лагічныя формы, катэгорыі, гіпотэзы Дз. вызначаў як інструменты, створаныя для вырашэння пэўнай сітуацыі. У сацыялогіі і палітыцы — апалагет імперыялізму ЗША. Зводзіў навучанне да засваення толькі практ. навыкаў.

Тв.: Рус. пер.— Введение в философию воспитания, М., 1921; Школа и общество, 2 изд., М., [1925].

ДЗЮБАПЛА Павел Кузьміч (н. 5.8.1931, в. Кукарава Бярэзінскага р-на), беларускі савецкі літаратуразнавец і крытык. Чл. КПСС з 1970. Канд. філал. н. (1962). З сялян. Скончыў БДУ (1954). Настаўнічаў. З 1960 навук. супрацоўнік, з 1968 заг. сектара бел. сав. л-ры Ін-та л-ры АН БССР. Даследуе сучасную бел. л-ру, праблемы рамана, тэндэнцыі яго развіцця, стылёвыя кірункі ў сучаснай прозе. Многія артыкулы Дз. прысвечаны тэме Айч. вайны ў л-ры.

Тв.: Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне, Мн., 1964; Праўда характару, у кн.: Дзюбайла П. К., Журавлёў В. П. і Луферау М. П. Праблемы сучаснай беларускай прозы, Мн., 1967; Час і людзі, у кн.: На высокай хвалі, Мн., 1968; Пошукі стылю, «Полымя», 1969, № 9; Невычэрпная тэма, там жа, 1970, № 5.

ДЗЮ БЕЛЕ (Du Bellay) Жаашэн (1522, Лірэ, правінцыя Анжу — 1.1.1560), французскі паэт, прадстаўнік л-ры Адраджэння. Адзін з кіраўнікоў літ. групы «Плеяда», у маніфесце якой «Абарона і ўзвелічэнне французскай мовы» (1549) сфармуляваў праграму абнаўлення франц. паэт. культуры шляхам пасычэння яе гуманіст. зместам. Аўтар зб. «Аліва» (1549). У зб. санетаў «Шкадаванні» і «Старажытнасці Рыма» (1558) адмоўна ставіўся да тагачаснага каталіцкага Рыма, услаўляў антычнасць, асуджаў войны. Вершы Дз. Б. вызначаюцца шчырым лірызмам, псіхал. пранікнёнасцю.

Тв.: Рус. пер.— У кн.: Поэты Возрождения, 2 изд., М., 1955; Из европейских поэтов, М., 1967; Дю Белле и Ронсар. Стихи, М., 1969.

ДЗЮБКО Анатоль Фёдаравіч (н. 15.12.1923, в. Горваль Рэчыцкага пав. Гомельскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945), палкоўнік (1963). З рабочых. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Ваен.-артыл. камандную акадэмію (1954). У Чырв. Арміі з 1941. У Айч. вайну на Паўн.-Зах., 2-м Прыбалт. і Ленінградскім франтах. Вызначыўся на ПнЗ ад г. Мадана Латв. ССР. 28.8.1944 вораг адрэзаў перадавыя сав. падраздзяленні. Лейтэнант Дз. прыняў камандаванне і арганізаваў абарону. Калі гітлераўцы наблізіліся да артыл. назіральнага пункта, Дз. выклікаў на сябе агонь сав. артылерыі. Гэта памагло адбіць контратаку і ўтрымаць занятыя пазіцыі. Служыць у Сав. Арміі.



ДЗЮБУА, Дзю Бойс (Dubois, Du Bois) Уільям Эдуард Бёркхарт (23.2.1868, г. Грэйт-Барынгтан, штат Масачусетс — 27.8.1963), негрыцянскі гісторык, пісьменнік, сацыёлаг, грамадскі дзеяч ЗША. Чл. Камуніст. партыі ЗША (з 1961). Скончыў ун-ты Фіска, Гарварда, Берліна. Д-р філасофіі (1895). У 1951 Дз. судзілі па абвінавачванні ў «неамерыканскім складзе думак і дзейнняў». Вызвалены пад паіскам сусв. і амер. грамадскасці. Няраз бываў у СССР. З 1961 у Гане, дырэктар Сакратарыята па пытаннях выдання Афр. энцыклапедыі. Пад яго кіраўніцтвам апублікавана шматтомнае даследаванне па сацыялогіі неграў. У працах па гісторыі Амерыкі і Афрыкі паказаў ролю негрыцянскага народа ў гісторыі сусв. культуры, яго барацьбу за свае правы, выкрываў каланізатарскую палітыку, расавую дыскрымінацыю. Аўтар зб. артыкулаў «Душы чорных людзей» (1904), кн. «Джон Браўн» (1909), «Негр» (1915) і інш. Перабольшваў ролю асветы і асабістага самаўдасканалення ў дэмакр. пераўтварэннях грамадства. Пасля 2-й сусв. вайны пад уплывам ідэй марксізма амяніў свае погляды (праца «У барацьбе за мір», 1952). Адзін з заснавальнікаў сучаснай негрыцянскай л-ры ЗША — раман «Па сярэбранае руно» (1911), кн. «Цёмная вада» (1920, навелы, нарысы, вершы), трылогія «Чорнае полымя» (1957—61). Адзін з пачынальнікаў руху «Ніягара» (1905) за раўнапраўе неграў. Арганізатар і ўдзельнік міжнар. панафрыканскіх кангрэсаў. Ганаровы доктар гістар. і юрыд. навук, філасофіі і літаратуры ун-таў многіх краін свету, з 1959 ганаровы доктар гістар. навук Маск. ун-та. Чл. Сусв. Савета Міру (з 1950), лаўрэат Міжнар. прэміі Міру (1953). Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1958. Бел. тэатр імя Я. Коласа ставіў п'есу Дз. «Гаіці» (1954).


Тв.: Black folk. Then and now, New York, 1945; Black Reconstruction in America, New York, 1956; рус. пер.— Джон Браун, М., 1960; Африка, М., 1961; Воспоминания, М., 1962; Цветные миры, М., 1964.

Літ.: Иванов Р. Ф. Дюбуа, М., 1968.

ДЗЮДЗЕВА, вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр Мусіцкага с/с. За 12 *км* на ПнЗ ад Слуцка, 16 *км* ад чыг. ст. Слуцк, 117 *км* ад Мінска. 358 ж., дварoў 119 (1971). Лесапільня. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЮ-ДО, від спартыўнай *барацьбы*.

ДЗЮКЛО (Duclos) Жак (н. 2.10.1896, г. Луэ), дзеяч французскага і міжнар. камуніст. і рабочага руху, гісторык. З сялян. З 13 гадоў пачаў працаваць (кандытар, пасля металіст). Удзельнічаў у 1-й сусв. вайне. Чл. Франц. кампартыі (ФКП) з 1921, з першых дзён яе заснавання. З 1926 чл. ЦК, з 1931 чл. Палітбюро ЦК. У 1931—64 сакратар ЦК ФКП. У 1935—43 чл. Выканкома Камінтэрна. У 1926—40 і 1946—58 дэпутат парламента, з 1959 сенатар. У гады ням. акупацыі Францыі адзін з арганізатараў Руху Супраціўлення. У 1945—46 віцэ-старшыня Устаноўчага сходу. З кастр. 1950 да сак. 1953, у час хваробы М. Тарэза, выконваў абавязкі ген. сакратара ФКП. Аўтар кніг па гісторыі Францыі, па гісторыі і праблемах французскага рабочага руху.





Тв.: L'Avenir de la démocratie, Paris, 1962; Batailles pour la République, Paris, 1968; De Napoléon III à de Gaulle, Paris, 1969; Mémoires, t. 1—3, Paris, 1968—70; рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, М., 1959; На штурм неба. Парижская коммуна — предвестница нового мира, М., 1963; Октябрь 17 года и Франция, М., 1967.

ДЗЮМА (Dumas) Аляксандр (Дзюма-бацька; 24.7.1802, Вілер-Катрэ каля Парыжа — 5.12.1870), французскі пісьменнік. Сын генерала-рэспубліканца. Літ. дзейнасць пачаў як драматург (рамант. драма «Генрых III і яго двор», 1829, і інш.). Сусв. вядомасць набылі яго гістор.-авантурныя і прыгодніцкія раманы: «Тры мушкецёры» (1844), «Каралева Марго» (1845), «Граф Монтэ-Крыста» (1845) і інш. Дз. не імкнуўся выявіць сац. заканамернасці гістар. з'яў, аднак найлепшым яго раманам уласцівыя майстэрскае ўзнаўленне побыту і нораваў розных гістар. эпох, характараў гістар. асоб, займальнасць і дынамізм сюжэта, багацце інтрыгі. У 50-я г. наведаў Расію («З Парыжа ў Астрахань», т. 1—5, 1858). Бел. т-р юнага гледача паставіў «Тры мушкецёры» (1968, паводле аднайменнага рамана Дз.).

Тв.: Рус. пер.— Двадцать лет спустя, М., 1956; Виконт де Бражелон, или Десять лет спустя, т. 1—3, М., 1957; Шевалье д'Арманталь, М., 1962; Асканио, М., 1965; Пьесы, Л.—М., 1965; Сорок пять, М., 1965; Три мушкетера, М., 1970.

Літ.: Моруа А. Три Дюма, пер. с франц., М., 1965.

ДЗЮМА (Dumas) Аляксандр (Дзюма-сын; 28.7.1824, Парыж — 27.11.1895), французскі пісьменнік. Сын А. *Дзюма*. Дэбютаваў як паэт (зб. «Грахі юнацтва», 1847). Аўтар раманаў «Дама з камеліямі» (т. 1—2, 1848), «Доктар Серван» (т. 1—2, 1849) і інш. Найб. вядомы драматург. твор «Дама з камеліямі» (драма паводле аднайм. рамана, паст. 1852; на сюжэт яе напісана опера Дж. Вердзі «Травіята»).

ДЗЮНЫ (ням. Dünen), пясчаныя ўзгоркі і градыы, нанесеныя ветрам з незамацаванага раслінасцю пяску. Адрозніваюць Дз. берагавыя (узбярэжжы мораў, вял. азёраў, рэк) і мацерыкоў*ыя (барханы)*.

Некаторыя Дз. ў плане маюць форму паўмесяца з выпуклым падветраным схіламі. Выш. да 10—30, часам да 100 *м* і больш. Падветраны схіл стромкі (да 30—40°), наветраны пакаты (8—20°). Дз. могуць перамяшчацца ў напрамку пануючых вятроў са скорасцю ад 1 да 20 *м* у год. У БССР замацаваныя раслінасцю Дз. на тэр. Палесся, Нёманскай, Нарачана-Вілейскай і Полацкай нізін; утварыліся ў апошнеледавіковы час ад развейвання водналедавіковых і алювіяльных пяскоў.

ДЗЮРЫНГ (Dühring) Яўген (12.1.1833—21.9.1921), нямецкі філосаф і эканаміст. Прыватдацэнт Берлінскага ун-та (1863—77). Філас. погляды Дз.— эклектычнае спалучэнне пазітывізму, вульгарнага матэрыялізму і ідэалізму. Антынавуковыя погляды Дз.— адна з ідэйных крыніц апартуніз му ў сацыял-дэмакр. партыі Германіі. Усебаковую крытыку

філас. і сацыялагічных поглядаў Дз. даў Ф. Энгельс.

Літ.: Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Леніи У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14, с. 227—232 (Полн. собр. соч., т. 18, с. 251—256).

ДЗЮРЭР (Dürer) Альбрэхт (21.5.1471, Нюрнберг — 6.4.1528), нямецкі жывапісец, гравёр і тэарэтык мастацтва. Адзін з самых значных майстроў Адраджэння. Вучыўся ў М. Вольгемута. Сфарміраваўся як майстар пад уплывам М. Шонгаўэра. У 1494—95 і 1505—07 наведаў Венецыю. У раннім творчасці («Свята пацерак», 1506) адчуваецца ўплыў рэнесансавай культуры. Цікавасць да псіхал. глыбіні вобраза найб. выявілася ў партрэтах Дз.: аўтапартрэты (1498, 1500), партрэты маладога чалавека (1521), І. Гольцшуэра (1526) і інш. Найвялікшае дасягненне сусв. графікі — гравюры Дз. Цыкл гравюр на дрэве «Апакаліпсіс» (1498) прасякнуты антыфеад. пастроем, рэліг. сюжэты напоўнены рэальным жыццёвым зместам; сярод лістоў самы вядомы «Чатыры коннікі». У другім цыкле («Жыццё Марыі», 1502—11) — яснае спакойнае апавяданне, поўнае жыццёвых чалавечых рысаў. З сярэдзіны 90-х г. Дз. стварае гравюры на медзі («Блудны сын», 1496; партрэты дзеячаў Рэфармацыі — В. Піркхеймера, 1524; Эразма Ратэрдамскага, 1526). Сярод гравюр на метале самыя выдатныя т. зв. «майстарскія гравюры»: «Рыцар, смерць і д'ябал» (1513), «Еранім у келлі» і «Меланхолія» (1514). У іх глыбіня філас. зместу, адухоўленасць вобразаў, пластычная завершанасць формы. Майстэрства Дз.-жывапісца асабліва сілы дасягнула ў апошняй яго рабоце «Чатыры апосталы» (1526), у якой мастак увасобіў рэнесансавае ўяўленне пра ідэальную мужную і інтэлектуальную асобу. Дз. напісаў некалькі трактатаў па тэорыі мастацтва. Найб. цікавыя аб перспектыве і аб прапорцыях чалавечага цела. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Адраджэнне*, *Германія*, *Графіка*.



Літ.: Нессельштраус Ц. Г. Альбрехт Дюрер, Л.—М., 1961 (бібліягр.).

ДЗЮСЕЛЬДОРФ (Düsseldorf), горад у ФРГ, адм. ц. зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія, на правым беразе Рэйна. Упершыню ўпамінаецца ў 12 ст. Вузел аўтамаб. дарог і чыгунак, рачны порт непадалёку ад Рурскага кам.-вуг. басейна, аэрапорт. 686 тыс. ж. (1968). Вялікі фінансавы, гандлёвы і прамысл. цэнтр. Чорная металургія (сталеліцейныя і трубапракатныя з-ды), вагона-, аўтамабіле- і станкабудаванне; электратэхн., хім., швейная, шкляная, папяровая, тэкст., харч., ваенная прамысловасць. Вытворчасць прамысл. і горнага абсталявання, дакладных вымяральных і аптычных прылад, радыёапаратуры. Мед. акадэмія, ін-т чорнай металургіі, Акадэмія мастацтваў, н.-д. ін-ты. Тэатры, кансерваторыя, музеі; арх. помнікі 13—18 ст.

ДЗЮФАІ (Dufay) Гіём (каля 1400, Камбрэ, Бургундыя — 27.11.1474), франка-фламандскі кампазітар. Адзін са стваральнікаў новай еўрап. поліфанічнай музыкі 15 ст. (гл. *Нідэрландская школа*). Аўтар многіх духоўных і свецкіх хар. твораў (месы, матэты, магніфікаты, песні), у якія ўводзіў нар. мелодыі.

ДЗЯВІЧКІ, гарадзішча днепра-дзвінскай культуры (1 ст. да н. э.— 3 ст. н. э.) каля в. Дзявічкі Полацкага р-на Віцебскай вобл., умацаванае валам і ровам. Даследавалася А. М. Ляўданскім, А. Р. Мітрафанавым, К. П. Шутам. Пры раскопках у ніжнім і верхнім пластах выяўлены касцяныя, крамяніовыя і жал. прылады працы. Насельніцтва займалася лядным земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам, апрацоўвала металы, косць, дрэва.

Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины, у кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики, М., 1959 (Труды Прибалтийской объед. комплексной экспедиции, [т. 1]).

ДЗЯВОЛТВА, гістарычная літоўская вобласць. У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца з 1219. У 1264 заваявана *Войшалкам* і ўключана ў склад Вял. кн. Літоўскага. Тэрыторыя Дз. не высветлена.

Літ.: Полное собрание русских летописей, т. 2, М., 1962; Пашуто В. Т. Образование Литовского государства, М., 1959. *М. І. Ермаловіч.* Маладзечна.

ДЗЯВОЧКА Міхаіл Фадзеевіч (1863, Мінск — г. см. невяд.), беларускі спартсмен-веласіпедыст. Служачы Лібава-Роменскай чыгункі. Пераможца гонак Масква — Ніжні Ноўгарад (410 вёрст), Пецярбург — Масква (650 вёрст). Чэмпіён Расіі (1894) і чэмпіён Англіі (1896) па гонках па трэку.

Літ.: Могильный Н. В. Олимпийский факел, Мн., 1965.

ДЗЯВОЧНІК (**зборная субота**), старадаўні звычай усходніх славян наладжваць вечарынку ў нявесты напярэдадні вяселля.

У суботу вечарам нявеста склікала да сябе дзяўчат-сябровак, сваячак, суседак, якія яе прыбіралі, запляталі касу, спявалі песні. Часам да Дз. прымяркоўвалі абрад завівання вясельнага дрэўца: вішнёвую, бярозавую ці яловую галінку, якая з'яўлялася сімвалам дзявоцтва, прыбіралі ў вянкі, кветкі. У сав. час дзяўчаты плятуць вянок для нявесты, прыбіраюць яе ў вясельную сукенку і вэлюм, рыхтуюць кветкі і гірлянды, каб упрыгожыць вясельны посад.

ДЗЯВОЧЫ ВІНАГРАД, **дзікі вінаград** (Parthenocissus), род раслін сям. вінаградавых. Вядома 15 відаў, пашыраных у Паўн. Амерыцы і Азіі. У СССР 3 віды (1 расце дзіка на Д. Усходзе, 2 культывуюцца). На Беларусі вырошчваецца Дз. в. пяцілісточкавы (P. quinquefolia).



Дзявочы вінаград пяцілісточкавы: *1* — галінка з суквеццямі; *2* — галінка з пладамі.

Павойныя кусты з вусікамі, расшыранымі на канцах. Лісце лопасцевае, на доўгіх чаранках. Кветкі зялёныя ў паўпарасоніках. Плод — сінявата-чорная ягада з слабым белым налётам. Пашыраная дэкар. расліна. Добра пераносіць маразы, хутка адрастае ўвесну. Размнажаецца чаранкамі і атожылкамі. Вырошчваецца на упрыгожванне балконаў, фасадаў будынкаў, альтанак.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэкаратыўныя расліны.*

ДЗЯГАВІЧЫ, вёска ў Чырванабудскім с/с Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр саўгаса «Дзягавічы». За 15 *км* на ПнУ ад Крычава, 121 *км* ад Магілёва, 7 *км* ад чыг. ст. Крычаў. 964 ж., гасп. 308 (1971). Сярэдняя школа, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДЗЯГІЛЕЎ Сяргей Паўлавіч [19(31).3.1872, Ноўгарадская губ.— 19.8.1929], рускі тэатр. дзеяч, антрэпрэнёр. Адзін з арганізатараў аб'яднання «Свет мастацтва» (1898) і рэдактар (з А. Бенуа) аднайм. часопіса (1899—1904). З 1907 наладжвае штогадовыя выступленні рус. артыстаў, т. зв. «Рускія сезоны» за мяжой (Парыж, Лондан). Гастролі трупы з удзелам М. Фокіна, Г. Паўлавай, В. Ніжынскага, Т. Карсавінай, К. Гельцэр і інш. садзейнічалі ўзнікненню балетнага т-ра ў ЗША, Лац. Амерыцы і інш. У 1911 стварыў трупу «Рускі балет С. Дзягілева» (існавала да 1929). З цягам часу ў спектаклях трупы мацнеў уплыў мадэрнізму, страцілася пераемнасць традыцый рус. балета.

Літ.: Луначарский А. В. В мире музыки, М., 1958; Грабарь И. Моя жизнь, М.—Л., 1937; Фокин М. М. Против течения, Л.—М., 1962.

ДЗЯГІЛІ, возера ў бас. Вуялянкі, левага прытока р. Нарач, у Мядзельскім р-не Мінскай вобл. Пл. 1,49 *км*². Даўж. 1,8 *км*, найб. шыр. 1,3 *км*, сярэдняя 0,8 *км*. Катлавіна круглаватая. Вадазбор плоскі, забалочаны. Сцёк з Дз. па пратоцы ў воз. Баторын. Водзяцца плотка, шчупак, ліпь, акунь, дыгір, лешч.

ДЗЯГІЛІ, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., каля воз. Дзягілі (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Суворава. За 12 *км* на ПнУ ад Мядзела, 168 *км* ад Мінска, 32 *км* ад чыг. ст. Варапаева. 237 ж., дварoў 77 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, магазін. Помнік 56 воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЯГІЛЬ (Archangelica), род двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. парасонавых. Вядома 10 відаў, пашыраных у тундравай і лясной зонах Паўн. паўшар'я. У СССР 5 відаў, на Беларусі адзін — Дз. лекавы (A. officinalis).



Дзягіль лекавы: *1* — галінка з кветкамі; *2* — кветка; *3* — плады.

Сцябло тонкабаразнаватае, услрэдзіне пустое, выш. да 2,5 *м*. Лісце двойчы-тройчы-перыстарассечанае. Кветкі дробныя, белавата-жаўтавата-зялёныя, сабраныя ў парасонікі. Расце ў забалочаных лясах, хмызняках, на балотах, па берагах рэк. Карэнішча і карані маюць эфірны ангелікавы алей. Дз. выкарыстоўваецца ў кандытарскай, лікёра-гарэлачнай вытворчасці і ў медыцыне як лекавая расліна. Маладыя парасткі ядомыя.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ДЗЯДЗІЛАВІЧЫ, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* (1—4 ст.) і паселішча (6—8 ст.), за 5 *км* на З ад в. Дзядзілавічы Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Даследавалася А. Р. Мітрафанавым (1961—65). У л-ры гарадзішча вядома пад назвай Замкавая гара. Размешчана на ўзгорку, умацавана 2 валамі і равамі. Пры раскопках выяўлены рэшткі жытлаў слупавой канструкцыі, знойдзены сярпы, зерняцёркі, косці жывёл, керамічны штрыхаваны посуд. На селішчы раскапаны рэшткі 55 паўзямлянкавых жытлаў з печамі-каменкамі, знойдзены жал. прылады працы, бронзавыя і бурштынавыя аздобы, каменныя жорны, абломкі гліняпага посуду, жал. шлакі. Грамадскі лад пераходны паміж першабытнародавай і сельскай (тэрытарыяльнай) абшчынай. Каля Дз. ёсць круглыя і доўгія курганы.

Літ.: Древности Белоруссии, Мн., 1966, с. 218—235.

ДЗЯДЗІНА, дзядзькава жонка. Гл. таксама *Родпасць і сваяцтва*.

ДЗЯДЗІНЕЦ, 1) цэнтральная частка сядзібы, двор. 2) Цэнтр. частка стараж. горада (старажытнарус. детинец), умацаваная драўляным тынам, равамі і валамі (пазней мураванымі сценамі і драўлянымі вежамі).

Найчасцей знаходзіўся на мысе пры сутоку рэк (Дз. Мінска пры сутоку Нямігі і Свіслачы, Дз. Полацка пры сутоку Палаты і Зах. Дзвіны). Плошча ад 1 да 7 *га* (полацкага 4,5 *га*, мінскага 3 *га*, віцебскага 2,5 *га*, друцкага 1 *га*). Дз.— своеасаблівы цэнтр горада, дзе размяшчаліся адм. і культавыя пабудовы, жылі князь з дружынаю, яго чэлядзь, духавенства. У стараж. летапісах слова Дз. ужываецца да 14 ст. Гл. таксама *Замак*, *Крамль*.

Літ.: Тихомиров М. Н. Древнерусские города, 2 изд., М., 1956; Раппопорт П. А. Очерки по истории русского военного зодчества X—XIII вв., М.—Л., 1956 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 52).

ДЗЯДЗЬКАВАННЕ, звычай аддаваць дзяцей шляхты на выхаванне ў сялянскую сям'ю. Было пашырана ў канцы 16 — пач. 18 ст. на беларускіх землях. Выклікана жаданнем выхаваць у дзяцей станоўчыя фізічныя і духоўныя якасці простага народа: працавітасць, сілу, непатрабавальнасць да яды, пітва і адзення, любоў да зямлі, вернасць, адданасць. Сярод народаў Каўказа падобны звычай называўся аталыцтвам.

У. С. Каратке́віч. Мінск.

ДЗЯДЗЮЛЯ Іван Прохаравіч (н. 18.9.1918, в. Асавец Бабруйскага пав. Мінскай губ.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1939), Вышэйшую дыпламат. школу (1947). У Чырв. Арміі з 1939. У партызанах з чэрв. 1942 — камандзір атрада, з сак. 1943 камісар, з чэрв. 1944

камандзір *партызанскай брыгады «Смерць фашызму»* Мінскай вобл. З жн. 1944 на парт. рабоце ў Смалявіцкім РК КП(б)Б, з 1947 на дыпламат. рабоце. Аўтар кніг (псеўд. І. П. Прохараў) «Германскае пытанне і забеспячэнне еўрапейскай бяспекі» (1954), «Лясная гвардыя» (1968). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

ДЗЯДЗЮШКА Уладзімір Іосіфавіч [н. 1(14).2.1905, Мінск], беларускі савецкі акцёр. Нар. арт. СССР (1971). Чл. КПСС з 1948. У 1923—37 акцёр у т-ры У. Галубка (БДТ-3). Ролі: Адзінота («Плытагоны» Галубка), Жадаў («Даходнае месца» А. Астроўскага), Гай («Мой сябар» М. Пагодзіна), Крамарчык («Сержант Дроб» Э. Самуйлёнка), Прэзідэнт («Каварства і каханне» Ф. Шылера). З 1937 у т-ры імя Я. Купалы. Характарны, камедыйны акцёр. Мяккі пластычны малюнак ролі, востра выяўленыя рысы характару, псіхал. абгрунтаванасць учынкаў спалучаюцца ў яго з яркім нац. каларытам. Асаблівы поспех мае ў бел. п'есах. З роляў: Мірон Бокуць («Пагібель воўка» Самуйлёнка), герцаг Альба («Фландрыя» В. Сарду), Вакуленка («Каліпавы гай» А. Карнейчука), Крыніцкі («Паўлінка» Я. Купалы), Крушына («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона), Пытляваны («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, Дзярж.







У. І. Дзядзюшка ў ролях Караваева («Мяцеж» паводле Дз. Фурманава; злева) і Крушыны.

прэмія СССР 1952), Язэп («Салавей» Зм. Бядулі, лаўрэат Прыбалт. вясны 1957), Моцкін («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка), Іларыён («Я, бабуся, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Р. Лордкіпанідзе), дзед Савось («Адкуль грэх?» А. Петрашкевіча). Здымаецца ў кіно («Несцерка», «Паўлінка» і інш.), удзельнічае ў тэлеспектаклях («Суд» Галубка, «Людзі на балоце» паводле І. Мележа, «Прымакі» Я. Купалы). Дэп. Вярх. Савета БССР 8-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

Літ.: Грыгор'ева Г. Акцёр мастацкай праўды, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960.

А. К. Саннікаў. Мінск.

ДЗЯДКІ (Agrimonia), род шматгадовых травяністых раслін сям. ружакветных. Вядома 10 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і. У СССР 7, на Беларусі 3 віды. Найб. пашыраныя Дз. аптэчныя (A. eupatoria, народныя назвы: рэпік, смятаннік, сучкі, шчэрб).



Дзядкі аптэчныя: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — плод.

Сцябло выш. да 2 м, апушанае. Лісце няпарнаперыстае з прылісткамі. Кветкі жоўтыя, духмяныя, сабраныя ў коласападобныя суквецці. Плады — дробныя шчаціністыя ўчэпістыя арэшкі, разносяцца жывёлаю. Растуць у лесе, у хмызняках, па лугах, берагах рэк, уздоўж дарог, плятоў. Расліна мае эфірны алей, дубільныя рэчывы, жоўтую фарбу.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ДЗЯДЫ, беларускі народны памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць памерлых родзічаў. Дз. называлі таксама дзень, калі адбываўся абрад, і ўсіх нябожчыкаў, што ўшаноўваліся.

Паходзяць ад дахрысціянскага ўсх.-слав. звычаю трызны; пазней абрад ускладніўся напластаваннем хрысціянскага культу. Дз. спраўлялі 3—4 і болей разоў у год (у залежнасці ад мясцовасці) вясною і ўвосень. Галоўныя былі змітраўскія Дз.— у суботу напярэдадні і пасля Змітрава дня (26 кастр. с. ст.), а таксама перад масленіцай, сёмухай, пілі-паўкай і інш. На Дз. звычайна гатавалася 7—11 святочных і абрадавых страў, абавязковыя былі куцця, бліны, клёцкі, яечня, мяса. Паводле звычаю ад кожнай стравы сімвалічна адкладвалася ў асобны посуд частка яды для нябожчыкаў. Бел. абрад Дз. увекавечаны А. Міцкевічам у паэме «Дзяды».

Літ.: Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 2, СПб., 1890; Романов Е. Белорусский сборник, в. 8, Вильна, 1912.

ДЗЯЖКЕЎ Сямён Іванавіч (каля 1605—1673), рускі мараход. У пач. 40-х г. 17 ст. з М. Стадухіным спусціўся па Індыгірцы да Паўн. Ледавітага ак., потым па моры дасягнуў Калымы, адтуль у 1648 з Ф. Аляксеевым (Паповым) праплыў вакол Чукоцкага п-ва і фактычна адкрыў Берынгаў праліў на 80 гадоў раней за Берынга. Імем Дз. названы мыс і хрыбет на Чукотцы, бухта ў Берынгавым м. У 1948 устаноўлена прэмія Геагр. т-ва СССР імя С. І. Дзяжнёва.

Літ.: Белов М. И. Семен Дежнев, 2 изд., М., 1955.

ДЗЯК (грэч. diákonos служка), у Расіі да 18 ст. начальнік і пісьмавод канцылярыі розных устаноў. Напачатку князеў слуга, якому даручалася казна і пісьмовыя справы; з 15 ст.— чын урадавай адміністрацыі, кіраўнік канцылярыі цэнтр. (т. зв. прыказа) і мясцовых устаноў.

Адрозніваліся Дз. гасударавы (царовы, вял. княз., княскія, дварцовыя), буйных феадалаў (у т. л. царкоўных), вечныя (пры гарадскім вечы), гарадскія, земскія і інш. Думныя Дз. (з 16 ст.) засядалі ў Баярскай думе, былі апорай самадзяржаўя ў барацьбе з баярскай арыстакратыяй.

Літ.: Леонтьев А. К. Образование приказной системы управления в Русском государстве, М., 1961.

ДЗЯКАВІЧЫ, вёска ў Жыткавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Кастрычнік». За 57 *км* на ПнУ ад Жыткавіч, 295 *км* ад Гомеля, 32 *км* ад чыг. ст. Старушкі. 942 ж., гасп. 240 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, магазін. 17 лют. 1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 651 мірнага жыхара (паводле ўдакладненых звестак).

ДЗЯКАНАЎ Мікалай Максімавіч (н. 5.12.1925, в. Аляксандраўка Кузнецкага пав. Саратаўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1950. На фронце з 1943. Вызначыўся ў канцы ліп. 1944 каля Брэста. Два дні наводчык ручнога кулямёта Д. адбіваў контратакі акружанай групоўкі праціўніка. Жыве ў Суджанскім р-не Курскай вобл.

ДЗЯКАЎ Іосіф Іванавіч [н. 22.3(4.4).1903, г. Гомель], Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1931. Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце. У Айч. вайну палітработнік па Зах. і 3-м Бел. франтах. У чэрв. 1944 у Дубровенскім р-не Віцебскай вобл. першы падняўся ў атаку; салдаты, натхнёныя яго прыкладам, авалодалі варожымі траншэямі. 15.7.1944 у баях за Гродна замяніў параненага камандзіра роты і на чале падраздзялення ўварваўся ў горад. Пасля вайны на парт. рабоце ў Гомельскай вобл. Жыве ў в. Яроміна Гомельскага р-на.



ДЗЯКАЎ Пётр Міхайлавіч [23.4(6.5).1916, с. Шышкіна Стаўранольскага пав.— 16.2.1945], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1939, нам. камандзіра штурмавой авіяэскадрыллі. Вызначыўся ў баях на Віцебска-Полацкім напрамку. Зрабіў 130 баявых вылетаў, удзельнічаў у 22 паветр. баях. У групе збіў 5 варожых самалётаў. Загінуў у баі.

ДЗЯКЛО, від прадуктовай феад. рэнты за зямельны надзел, якая збіралася на карысць землеўладальніка з сялян Вялікага кн. Літоўскага. Дз. найчасцей аддавалі збожжам, у некат. маёнтках — птушкаю, сенам, дрывамі і інш. Да *валочнай памеры* Дз. бралі з *дварышча*, службы, пазней — з *валокі* і *дыму*. Паводле *«Уставы на валокі»* 1557 памер Дз. складаў «аўса з валок добрага і сярэдняга ігрунту па 2 бочкі, а з подлага — 1 бочка». Паводле інвентару маёнтка Гарадзішча Навагрудскага ваяводства з валокі аддавалі Дз.— жыта 1 бочку, аўса 1 бочку. Пры агародзе землеўладальніка Дз. магло быць заменена грашыма.

В. І. Мялешка. Мінск.

ДЗЯКОЎСКАЯ КУЛЬТУРА, культура фінаугорскіх плямёнаў, якія ў 7 ст. да н. э.— 5 ст. н. э. жылі ў міжрэччы Волгі і Акі, у Верхнім Падзвінні, на Валдайскім узвышшы. Назву атрымала ад гарадзішча каля в. Дзякова (у межах Масквы). Даследавалася Дз. Я. Самаквасавым, У. І. Сізовым, А. А. Спіцыным і інш. Насельніцтва Дз. к. жыло патрыярхальнымі сем'ямі ў наземных жытлах і паўзямлянках на гарадзішчах і паселішчах. Займалася жывёлагадоўляй, лядным земляробствам, паляваннем і рыбалоўствам, выраблялі жалезныя і касцяныя прылады працы, бронзавыя ўпрыгожанні. Кераміка слоікападобнай формы з тэкстыльнымі адбіткамі і арнаментам на верхняй частцы пасудзін. Жыхары Дз. к.— продкі плямёнаў меры, весі і інш.

Літ.: Третьяков П. Н. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге, М.—Л., 1966.

А. Р. Мітрафанаў. Мінск.

ДЗЯЛЕНДЗІК Анатоль Андрэевіч (н. 4.3.1934, в. Кулакі Старобінскага р-на), беларускі савецкі драматург. З служачых. Чл. КПСС з 1963. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1957), Літаратурны ін-т імя М. Горкага (1969). Працаваў урачом-псіхіятрам. З 1968 на кінастудыі «Беларусьфільм». Друкуецца з 1955. Першы зб. гумару і сатыры «Пагібель «Тытаніка» (1963). Аўтар п'ес пра духоўную сілу сав. людзей і іх маральную і грамадз. адказнасць («Выклік багам», паст. т-раў імя Я. Коласа, 1965, Брэсцкага, 1965, імя Я. Купалы, 1966, Гомельскага, 1966; «Грэшнае каханне», паст. Брэсцкага, 1967, і Гомельскага, 1968, т-раў; «Начное дзяжурства», паст. т-ра імя Я. Купалы, 1971). Гэтым п'есам уласцівыя дынамізм, эмацыянальная і псіхал. напружанасць. Героі іх высакародныя, моцных характараў, чыстых пачуццяў.

Тв.: Выклік багам, Мн., 1967.

Літ.: Клышка А. З добрай усмешкай, «Полымя», 1964, № 1; Орлова Т. Ты и я, Мн., 1969, с. 174—193.

В. В. Казлова. Мінск.

ДЗЯЛЕННЕ, арыфметычнае дзеянне, якое заключаецца ў тым, каб знайсці адзін з двух сумножнікаў, калі вядомыя іх здабытак і другі сумножнік. Дз.— дзеянне, адваротнае *множанню*. Падзяліць a на b значыць знайсці такі невядомы лік x, каб выконвалася $bx=a$, ці $xb=a$. Вынік Дз. x наз. дзеллю. Зададзены здабытак a наз. дзелівам, а зададзены множнік b — дзельнікам. Абазначаюць Дз. двухкроп'ем $(a:b)$ ці рыскай $(\frac{a}{b}$ або $a/b)$.

Дз. ў сістэме цэлых лікаў не заўсёды магчымае (9 не дзеліцца на 4), але калі яно магчымае, вынік Дз. адназначны. У сістэме рацыянальных лікаў (цэлых, дробных і нуля) Дз. заўсёды выконваецца і яно адназначнае, акрамя Дз. на нуль, што немагчыма. Абагульненнем звычайнага Дз. з'яўляецца Дз. з астачай. Падзяліць з астачай цэлыя неадмоўныя лікі a на b — знайсці такія 2 цэлыя неадмоўныя лікі x і y, якія б задавальнялі патрабаванні: $a=bx+y$, $y<b$. Лік a наз. дзелівам, b — дзельнікам, x — няпоўнай дзеллю (пры $y+0$) ці дзеллю (пры $y=0$), y — астачай. Гл. таксама *Падзельнасць*.

Т. М. Яноўская. Мінск.

ДЗЯЛЕННЕ КЛЕТКІ, сукупнасць працэсаў, пры якіх з адной клеткі ўтвараюцца дзве; аснoўны спосаб размнажэння аднаклетачных арганізмаў і павелічэння колькасці клетак у складаным арганізме пры яго росце, развіцці, рэгенерацыі.

Складаецца з падрыхтоўчай стадыі, калі падвойваецца (рэпрадукуецца) колькасць спадчыннага матэрыялу, і заключнай (уласна Дз. к.), калі матэрыял бацькоўскай клеткі размяркоўваецца паміж дачкінымі. Адрозніваюць 2 тыпы Дз. к.: прамое (амітоз) і непрамое *(мітоз).* Пры амітозе (адкрыў бельг. вучоны Б. Дзюмарцье, 1832) ядро клеткі дзеліцца без бачнай марфалагічнай яго перабудовы. Генетычны матэрыял паміж дачкінымі клеткамі можа размяркоўвацца нераўнамерна. Пасля дзялення ядра пратаплазма дзеліцца не заўсёды: узнікаюць двух'ядравыя і шмат'ядравыя клеткі. Мітоз болей пашыраны і дасканалы. Пры ім колькасць храмасом і ДНК паміж дачкінымі клеткамі размяркоўваецца дакладна. Адменны тып мітозу — *мейоз.*

Літ.: Введение в цитологию, Л., 1968; Константинов А. В. Общая цитология, 2 изд., Мн., 1968; Рябов К. П. Гистология с основами эмбриологии, Мн., 1968; Алов И. А., Брауде А. И. и Аспиз М. Е. Основы функциональной морфологии клетки, 2 изд., М.— Прага, 1969.

А. В. Пішчыкскі. Мінск.

ДЗЯЛЁЦ Міхаіл Іванавіч (1.7.1918, в. Вуглы Мазырскага пав. Мінскай губ.), беларускі савецкі журналіст. З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў БДУ (1951). У 1939—46 у Сав. Арміі, удзельнік Айч. вайны. У 1949—54 працаваў у рэдакцыі баранавіцкай абл. газеты «Чырвоная звязда», у 1954—57 рэдактар баранавіцкай аб'яднанай (гарадской і раённай) газ. «Чырвоная звязда». У 1957—69 на сав., парт. і прафс. рабоце: старшыня Баранавіцкага гарвыканкома, першы сакратар Гарадзішчанскага РК КПБ, Баранавіцкага РК КПБ, Баранавіцкага ГК КПБ, старшыня Брэсцкага абл. савета прафсаюзаў. З 1969 рэдактар рэсп. газ. «Звязда». На XXV з'ездзе КПБ выбраны кандыдатам у члены ЦК, на XXVII з'ездзе КПБ — чл. ЦК; дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 6—8-га склікання. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

ДЗЯЛІЛЬНАЯ ГАЛОЎКА, прыстасаванне да металарэзных станкоў для паварочвання на пэўныя долі абароту дэталі, якую апрацоўваюць.

Адрозніваюць Дз. г. механічныя і аптычныя. Механічныя бываюць з лімбам, па якім адлічваюць неабходны вугал павароту, і без лімба, дзе паварот *шпіндэля* забяспечваецца зменнымі зубчастымі коламі. Механічныя Дз. г. падзяляюцца на простыя і універсальныя. Універсальныя даюць магчымасць падзяліць вугал павароту на адвольныя часткі. Для большай дакладнасці дзялільных аперацый карыстаюцца аптычнымі Дз. г. з мікраскопам. Аптычныя Дз. г. не патрабуюць складаных разлікаў пры карыстанні імі, простыя па канструкцыі, але не могуць рабіць аўтаматычнага дзялення.

Літ.: Оглоблин А. Н. Делительные головки и их настройки, М.—Л., 1964.

ДЗЯЛІМАСЦЬ, гл. *Падзельнасць.*

ДЗЯЛЬЦОЎ Павел Андрэевіч [13(26).1.1917, Іванава-Вазнясенск — 23.5.1969], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1935. На фронце з 1941, камандзір бамбардзіровачнай авіяэскадрыллі. Зрабіў 289 баявых вылетаў. У час вызвалення Беларусі лётчыкі пад камандаваннем Дз. знішчылі мост цераз Бярэзіну, па якім адступаў праціўнік.

ДЗЯЛЯЦІЧЫ, вёска ў Вераскаўскім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл., на левым беразе Нёмана. Цэнтр калгаса «Сцяг Саветаў». За 30 *км* на ПнУ ад Навагрудка, 210 *км* ад Гродна, 55 *км* ад чыг. ст. Навагрудка, на шашы г. п. Любча — в. Усялюб. 895 ж., гасп. 360 (1971). Пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік 53 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЯМЕНЦЬЕЎ Васіль Аляксеевіч [н. 22.3(4.4).1908, в. Судбішчы Навасільскага пав. Тульскай губ.], беларускі савецкі географ. Канд. геагр. н. (1938), праф. БДУ (1961). Скончыў геагр. ф-т Ленінградскага дзярж. ун-та (1930). Даследаваў Зах. Сібір, Палярны Урал. Аўтар сістэмы фізіка-геагр. і геамарфал. раянавання БССР, прац па ландшафтах Беларусі, па праблемах Беларускага Палесся, гісторыі геаграфіі. Удзельнічаў у складанні Атласа БССР, у распрацоўцы праекта і яго ландшафтнага абгрунтавання для прыгараднай зоны г. Мінска. Заг. кафедры фіз. геаграфіі СССР БДУ. Прэзідэнт Геагр. т-ва БССР (з 1962).

Тв.: Схематическая карта рельефа центральной части Западно-Сибирской низменности, «Известия Государственного географического общества», 1937, т. 69, в. 5; (разам з А. Х. Шкляram і В. П. Якушкай) Прырода Беларусі, Мн., 1959; Система физико-географических районов Белоруссии, у кн.: Физическая и экономическая география, Мн., 1960; (разам з А. Н. Андрушчанкам) История географии, ч. 1, Мн., 1962; (у сааўт.) География Белоруссии, Мн., 1965; (у сааўт.) Белоруссия, М., 1967 (Советский Союз).

ДЗЯМЕНЦЬЕЎ Іван Андрэевіч (1901, с. Судбішчы Навасільскага пав. Тульскай губ.— 15.10.1964), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941, камандзір гарматы. Вызначыўся ў Мінскай вобл. 8.7.1944. Адбіваючы контратакі каля в. Самахвалавічы, знішчыў гармату, 12 кулямётаў праціўніка.

ДЗЯМЁШКА Міхаіл Кузьміч (н. 20.4.1928, в. Вялікчаўцы Ушацкага р-на Полацкай акр.), перадавік буд-ва, Герой Сац. Працы (1971). Засл. будаўнік БССР (1965). Чл. КПСС з 1952. У 1946—58 муляр, з 1958 брыгадзір муляроў буд. ўпраўлення № 42 трэста Полацксельбуд. Узнаг. ордэнамі Леніна, Прац. Чырв. Сцяга.

ДЗЯМІДАВІЧЫ, вёска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 13 *км* на Пн ад Дзяржынска, 52 *км* ад Мінска, 15 *км* ад чыг. ст. Койданава. 204 ж., дварoў 63 (1971). Пач. школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 33 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДЗЯМІДАВІЧЫ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Сураў. Цэнтр сельсавета. За 12 *км* на У ад Касцюковіч, 172 *км* ад Магілёва, 15 *км* ад чыг. ст. Камуны, па аўтамаб. дарозе Касцюковічы — Хоцімск. 190 ж., гасп. 67 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ДЗЯМІДАВІЧЫ, вёска ў Іванскім с/с Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., каля р. Уза (1,5 *км*). Цэнтр калгаса «Дзямідавічы». За 12 *км* на Пн ад Чашнікаў, 83 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, на шашы Чашнікі — в. Бачайкава. 222 ж., гасп. 83 (1971). Пач. школа, б-ка, магазін. Помнік 57 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЯМІДАЎ, вёска ў Галоўчыцкім с/с Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл., каля р. Славечна (1 *км*). Цэнтр калгаса «Дружба». За 29 *км* на ПдЗ ад Нароўлі, 207 *км* ад Гомеля, 28 *км* ад чыг. ст. Ельск. 465 ж., дварoў 151 (1971). Лясніцтва, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, 2 магазіны. У ліст. 1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску.

ДЗЯМІДАЎ Аляксандр Аляксандравіч (н. 1915, в. Полцева Чэрнскага пав. Тульскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943, сапёр. Вызначыўся ў Брагінскім р-не Палескай вобл. 28—29.9.1943 пад артыл. і мінамётным агнём праціўніка на лодцы і плытах пераправіў на зах. бераг Дняпра падраздзяленні і артылерыю палка. Жыве на радзіме.

ДЗЯМІДАЎ Аляксандр Сяргеевіч (н. 20.7.1919, в. Базякова Спаскага пав. Казанскай губ.), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Скончыў ваен. пяхотнае вучылішча (1941). У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну ўдзельнічаў у абароне Магілёва. У партызанах са студз. 1942 — камандзір узвода, роты, атрада, з ліп. 1943 камандзір *партызанскага палка 15-га* Магілёўскай вобл. Пасля вайны на сав. рабоце ў Гродне. Аўтар нарысаў і кнігі «У атаку падымаўся першым» (1967). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Ратушнов Н. В боевом походе, Мн., 1960; Храмович Г. Три партизанских года, Мн., 1967.

ДЗЯМІДАЎ Васіль Аляксандравіч (н. 12.4.1921, Віцебск), Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1946. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію (1955). У Чырв. Арміі з 1940. У Айч. вайну з 1943 на Зах. і 3-м Бел. франтах — камандзір звяна разведвальнага авіяпалка. Зрабіў 226 баявых вылетаў. 2.11.1944 ва Усх. Прусіі варожы зенітны снарад прабіў бензабак самалёта і параніў лётчыка. Аднак Дз. здолеў сфатаграфаваць палосу абароны праціўніка і пасадзіць самалёт на сваёй тэрыторыі. З 1967 працуе ў Віцебскім аэрапорце.



ДЗЯМІДАЎШЧЫНА, вёска ў Гарадзецкім с/с Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 33 *км* на У ад Кобрына. 78 *км* ад Брэста, 12 *км* ад чыг. ст. Гарадзец, на шашы Кобрын — г. п. Антопаль. 393 ж., гасп. 127 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік сав. воінам, партызанам і мірным жыхарам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЗЯМЧУК Давыд Сямёнавіч [н. 2(14).2.1897, в. Шчарбін Брэсцкага пав. Гродзенскай губ.], удзельнік грамадз. вайны. Ген.-м. (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Ваен. акадэмію Ген. штаба (1944). У Чырв. гвардыі з кастр. 1917. З 1918 да 1921 на Паўд.-Зах. і Паўд. франтах — нач. разведкі, камандзір узвода; удзельнік барацьбы з антонаўшчынай, басмацтвам. У Айч. вайну на Зах., Паўд. і Цэнтр. франтах — камандзір палка, нам. камандзіра, камандзір дывізіі. З 1948 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

ДЗЯМ'ЯНАЎЦЫ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., на левым беразе Нёмана. Цэнтр сельсавета і калгаса «Дружба». За 30 *км* на ПнЗ ад Дзятлава, 108 *км* ад Гродна, 26 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 375 ж., гасп. 104 (1971). Павільён быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У Вял. Айч. вайну ў паваколлі Дз. (Лінічанская пушча) дыслацыраваўся *партызанская брыгада Ленінская* Баранавіцкай вобл. Помнік 23 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЯМ'ЯНАЎ Мікалай Якаўлевіч [15(27).3.1861, г. Цвер — 19.3.1938], савецкі хімік-арганік. Акад. АН СССР (1929, чл.-кар. 1927). Праф. Маскоўскай с.-г. акадэміі імя Ціміразева. З 1935 заг. лабараторыі ў Ін-це арган. хіміі АН СССР. Распрацаваў агульны спосаб атрымання нармальных насычаных гліколяў і ненасычаных спіртоў. Адкрыў заканамернасці ізамерызацыі карбацыклічных злучэнняў з расшырэннем ці звужэннем цыкла (перагрупоўка Дз.). Сінтэзаваў шэраг цяжкаступных арган. злучэнняў. Займаўся пытаннямі агранамічнай хіміі і хіміі раслін. Прэмія імя Леніна 1929.

Літ.: Николай Яковлевич Демьянов, М., 1956 (бібліягр.).

ДЗЯМ'ЯНЕНКА Іван Мікітавіч (н. 1915, с. Аляксееўка Марыупальскага пав. Екацярынаслаўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1941. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15.10.1943 з радыёстанцыяй пераправіўся цераз Дняпро, удзельнічаў у рукапашным баі, выявіў 2 артыл. і мінамётную батарэі ворага, карэкціраваў агонь палка.

ДЗЯМ'ЯНКІ, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Іпуць. Цэнтр сельсавета і калгаса «Молат». За 22 *км* на ПнУ ад Добруша, 50 *км* ад Гомеля, 15 *км* ад чыг. ст. Злынка (Вышкаў, РСФСР). 1249 ж., дварoў 325 (1970). Цагельня, кандытарскі цэх, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле 122 сав. воінаў, помнік 225 землякам, якія загінулі ў Айч. вайну. За 5 *км* ад Дз. курганная група (159 курганоў) сярэдзіны 1-га тысячагоддзя — пач. 11 ст., якая належала радзімічам. У 1962—63 даследавалася Г. Ф. Салаўёвай.

Літ.: Соловьева Г. Ф. Славянские курганы близ с. Демьянки, «Советская археология», 1967, № 1.

ДЗЯНІКІН Антон Іванавіч [22.11(4.12).1872—8.7.1947], ген.-л. царскай арміі, галоўнакамандуючы контррэвалюц. войск Пд Расіі ў час *грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі ў СССР 1918—20*. У 1-ю сусв. вайну камандаваў дывізіяй, корпусам, Зах., Паўд.-Зах. франтамі. За ўдзел у *карнілаўшчыне* зняволены ў Быхаўскай турме, адтуль у 1917 уцёк на Дон. У канцы 1917 з Л. Г. Карнілавым і М. В. Аляксеевым стварыў белую добраахвотніцкую армію, якую ўзначаліў пасля смерці Карнілава (13.4.1918), у пач. 1919 падпарадкаваў белаказацкія арміі Дона і Кубані і т. ч. аб'яднаў контррэвалюц. сілы на Пд. Летам 1919 захапіў Данбас і пачаў паход на Маскву. Пасля разгрому ў сак. 1920 па Паўн. Каўказе з рэшткамі арміі збег у Крым. 4.4.1920 перадаў камандаванне Урангелю і эміграваў. У мемуарах пра грамадз. вайну тэндэнцыйна ацэньваў падзеі, але змясціў шмат дакумент. матэрыялаў.

Літ.: Против Деникина. Сб. воспоминаний, М., 1969.

ДЗЯНІС (прозвішча, імя па бацьку і гады жыцця невяд.), селянін з в. Сімакава Навагрудскага пав. Гродзенскай губ., герой Айч. вайны 1812. 28.6.1812 рус. казацкі раз'езд выявіў каля в. Сімакава педалёка ад мяст. Мір групу франц. салдатаў. Па даручэнні камандавання Дз. з м. Стоўбцы правёў па забалочанай мясціне казакоў ген. М. І. Платава, якія нечакана напалі і разгромілі пад Міром кав. дывізію ген. Ражнецкага.

Літ.: Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 г., Мн., 1962; Харкевич В. Действия Платова в арьергарде Багратиона в. 1812 г., СПб., 1901. *Я. І. Карнейчык.* Мінск.

ДЗЯНІСАВА, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Падпарадкоўваецца Казлоўшчынскаму гарпасяльковаму Савету; цэнтр калгаса «Слава працы». За 20 *км* на ПдЗ ад Дзятлава, 154 *км* ад Гродна, 28 *км* ад чыг. ст. Слонім, каля шашы Ліда — Слонім (1 *км*). 223 ж., гасп. 62 (1971). Б-ка, магазін. Дз. названа ў гонар засл. калгасніка, удзельніка штурму Зімняга і грамадз. вайны ў СССР Р. І. Дзяніса.

ДЗЯНІСАЎ Аляксей Міхайлавіч (н. 10.5.1918, с. Ерпелева Сяргацкага пав. Ніжагародскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1938. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 28.9.1943 штурмавая група на чале з капітанам Дз. фарсіравала Дняпро каля Лоева, захапіла плацдарм, утрымлівала яго на працягу сутак. Гэтым была дадзена магчымасць асн. падраздзяленням палка пераправіцца цераз раку і замацавацца на плацдарме. Жыве ў Таліне.

ДЗЯНІСАЎ Захар Мікалаевіч [н. 27.1(8.2).1892, в. Кляпчаны Слуцкага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне балотазнаўства, батанікі і лугаводства. Канд. с.-г. н. (1937). Скончыў Горы-Горацкі земляробчы ін-т (1924). Працаваў у Гомельскім лесатэхн. ін-це, БДУ, Бел. НДІ меліярацыі і воднай гасп. (1930—64). З 1964 дацэнт кафедры сістэматыкі раслін БДУ. Працы Дз. па прыродазнаўча-гістар. класіфікацыі балот, асаблівасцях балота- і пародаўтварэння, па фарміраванні і размяшчэнні балот на тэр. БССР, па даследаванні і паляпшэнні лугоў Беларусі.

Тв.: Естественно-историческая классификация болот БССР, у кн.: Сборник научных трудов Ин-та мелиорации, водного и болотного хозяйства АН БССР, т. 1, Мн., 1951; Болотообразование как стадия почвообразования и породообразования, у кн.: Труды Научно-исследовательского ин-та мелиорации и водного хозяйства АН БССР, т. 7, Мн., 1956; у кн.: Кормовые угодья БССР и их улучшение, Мн., 1956; Паляпшэнне натуральных кармавых угоддзяў БССР, Мн., 1956; Паляпшэнне лугоў БССР, Мн., 1960.

ДЗЯНІСАЎ Міхаіл Іванавіч [8(21).10.1900, в. Трасцянка Балашоўскага пав. Саратаўскай губ.— 11.1.1971], беларускі савецкі спявак (барытон). Нар. арт. БССР (1944). Чл. КПСС з 1946. У 1933 скончыў Бел. студыю оперы і балета па класе А. Бапачыча. У 1933—41 і 1944—58 салліст Бел. т-ра оперы і балета (у 1941—43 у Ерэванскім т-ры оперы і балета імя Спендыярава). Дз. ярка выступіў у бел. рэпертуары (Кузьміч у оперы «У пушчах Палесся» А. Багатырова, Змітрок і Апанас у операх «Міхась Падгорны» і «Алеся» Я. Цікоцкага, Кастусь Каліноўскі ў аднайм. оперы Дз. Лукаса). Партыі з класічных опер: Анегін, Ялецкі, Мазепа («Яўген Анегін», «Пікавая дама» і «Мазепа» П. Чайкоўскага), князь Ігар («Князь Ігар» А. Барадзіна), Дэман («Дэман» А. Рубінштэйна), Рыгалета, Жэрмон («Рыгалета» і «Травіята» Дж. Вердзі), Фігара («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Эскамільё («Кармэн» Ж. Бізэ)





М. І. Дзяніса ў ролі Рыгалета.

і інш. Дз. ўласцівыя мяккасць гучання голасу, лірычная напоўненасць і асэнсаванасць выканання, старанная вакальная і сцэнічная апрацоўка ролі. У 1964—71 выкладчык Бел. кансерваторыі. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Пукст Р. Натхнёны спявак, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960.

ДЗЯНІСАЎ Павел Іванавіч (н. 21.10.1921, г. Гур'еў Уральскай вобл.), наватар вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Айч. вайны. Прац. дзейнасць пачаў на нафтавым промысле «Макат» Каз. ССР. З 1961 на Полацкім нафтаперапр. з-дзе: нач. тэхнал. цэха, з 1971 нач. вытворчасці каталітычных працэсаў. Узнаг. ордэнамі Леніна, Айч. Вайны 2-й ступені, медалямі.

ДЗЯНІСАЎ Павел Ферапонтавіч [н. 13(26).8.1911, г. Аляксандраўск-Грушаўскі Вобл. Войска Данскога], беларускі савецкі музыкант, трубач. Засл. арт. БССР (1954). Вучыўся ў Маск. кансерваторыі (1935—38). У 1938—44 першы трубач і канцэртмайстар групы аркестра Свярдлоўскага т-ра оперы і балета, у 1944—66 — Бел. т-ра оперы і балета.

ДЗЯНІСКАВІЧЫ, вёска ў Ганцавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Расія». За 25 *км* на У ад Ганцавіч, 275 *км* ад Брэста, канцавы аўтобусны прыпынак на шашы, якая злучае вёску з Ганцавічамі. 3469 ж., двароў 927 (1971). Лясніцтва, смалакурны завод, філіял камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі, сталовая, 5 магазінаў. У Вял. Айч. вайну ў Дз. дзейнічала падпольная камсамольская арг-цыя. Помнік на брацкай магіле 15 сав. воінаў і партызанаў, помнік 160 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Айч. вайну. Каля Дз. курганы могільнік часоў Кіеўскай Русі.

«ДЗЯННІЦА», грамадская і літаратурная газета, якая выдавалася ў Петраградзе з 1 ліст. да 31.12.1916 на бел. мове (друкавалася рус. літарамі); выйшла 7 нумароў. Змяшчала матэрыялы пра цяжкае становішча Беларусі ў 1-ю імперыял. вайну, ставіла пытанні развіцця асветы, увядзення ў школах навучання на роднай мове, абмяркоўвала пытанні бел. граматыкі. Друкавала творы Ц. Гартнага, К. Буйло, Х. Чарнышэвіча, А. Паўловіча і інш. Рэдактар-выдавец Ц. Гартны (З. Х. Жылуновіч).


Літ.: Жылуновіч З. Эпізод з жыцця беларускай часопісі, «Полымя», 1923, № 7—8; Александровіч С. Х. З гісторыі выдання беларускіх газет «Дзянніца» і «Светач», «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Сер. IV», 1969, № 3. *С. Х. Александровіч.* Мінск.

«ДЗЯННІЦА», першая сав. газета на беларускай мове, орган Беларускага Нацыянальнага Камісарыята (аддзела Наркамнаца РСФСР). Выдавалася з 1.3.1918 у Петраградзе, з 6.4.1918 (з № 6) да 24 люг. 1919 у Маскве. З № 40 выходзіла як веснік Бел. Нац. Камісарыята і Маскоўскай Бел. секцыі РКП(б). Змяшчала матэрыялы пра барацьбу працоўных Беларусі супраць ням. інтэрвентаў; артыкулы па агульнапаліт., эканам. і нац. пытаннях, бел. мастацкія творы. У № 1 надрукаваны «Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа», адозва да рабочых, салдатаў і сялян Беларусі пра абарону заваёў Кастр. рэвалюцыі. У № 8 змешчаны арт. «Беларусь як частка Савецкай Федэратыўнай Рэспублікі». Апублікаваны тэкст Маніфеста Часовага рэвалюц. рабоча-сялянскага ўрада Беларусі аб абвяшчэнні Беларускай ССР, пастанова Прэзідыума ВЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР, першыя пастановы Бел. сав. ўрада і 1-га Усебел. з'езду Саветаў. Газета паведамляла пра становішча ў акупаванай Беларусі і заклікала да барацьбы за хутчэйшае яе вызваленне, выкрывала антынародную дзейнасць бел. бурж. нацыяналістаў. *С. В. Марцэлеў.* Мінск.

ДЗЯРАЖНЯ, рака, правы прыток Беседзі (бас. Сажа). Даўж. 54 *км*. Цячэ ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (312 *км*²) на ПдУ Аршанска-Магілёўскай раўніны, значна забалочаны і залесены. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,8 *м*³/*сек*.

ДЗЯРАЖЫЧЫ, прыстань на правым беразе Дняпра, вёска ў Быванькаўскім с/с Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. За 25 *км* на Пд ад Лоева, 125 *км* ад Гомеля, 55 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 392 ж., гасп. 158 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны. У кастр. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Абеліск на брацкай магіле 1184 сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну; сярод іх Героі Сав. Саюза А. *Дэхканбаеў*, А. П. *Еўдакімаў*, М. І. *Міхайлаў*, Ф. К. *Папоў*, Б. В. *Самсонаў*, І. *Ургеныш-баеў*.

ДЗЯРАЧКА (Asperula), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. марэнавых. Вядома 80 відаў, пашыраных у Еўропе, Паўн. Афрыцы, Азіі, Аўстраліі. У СССР каля 60 відаў, на Беларусі 3.



Дзярачка пахучая: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка; *3* — плады.

Сцябло прамастойнае, граністае, выш. да 50 см. Лісце ланцэтнае, шурпатае па краях, у кальчаках. Кветкі дробныя, духмяныя, у шчыткападобных мяцёлках. На Беларусі найб. вядомая Дз. пахучая (A. odorata). Расце ў цяністых шыракалістых і хвойных лясах. Меданос. Вырошчваецца як дэкар. расліна. Мае кумарын, эфірны алей, дубільныя рэчывы.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ДЗЯРГАЙ Сяргей Сцяпанавіч [н. 17(30).9.1907, Мінск], беларускі савецкі паэт. Сын чыгуначніка. У сярэдзіне 30-х г. працаваў у газ. «Звязда». У Айч. вайну ўдзельнік падпольнага і партыз. руху (г. Гомель). У 1951—52 супрацоўнік час. «Полымя», у 1953—67 час. «Вожык». Друкуецца з 1938. Першы зб. «Вачыма будучыні» (1953). Асн. ў лірыцы Дз.— патрыят. матывы любові да роднай зямлі, яе людзей, прыроды, услаўленне велічы спраў сав. чалавека, філас. роздум. З фі-



лас. лірыкай звязана цяга паэта да верлібра, хоць у яго паэзіі пераважаюць традыцыйныя класічныя і песенна-народныя рытмы і вобразы, ярка выражаная фальк.-нар. лексіка. Гразы, ярка выражаная фальк.-нар. лексіка. Гразмадз. тэмперамент, філасофска-наглыблены склад паэт. мыслення, арыгінальнасць стылю Дз. найб. выявіліся ў зб. «Чатыры стыхіі» (1962, літ. прэмія імя Я. Купалы 1964). Аўтар паэм «На шашы энтузіястаў» (1953), «Песня пра Туркменскі канал» (1951) і інш. Гумарыст. вершы ў кн. «Цешча» (1959), «Салата з дзядоўніку» (1967). Перакл. на бел. мову паасобныя тв. А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, М. Канапніцкай, У. Бранеўскага, А. Блока, М. Лермантава, У. Маякоўскага, Л. Украінкі, П. Тычыны, Т. Масэнкі і інш.

Тв.: Выбранае. Паэзія, Мн., 1967; Крэмень аб крэмень, Мн., 1958; Свята ў будзень, Мн., 1964.
Літ.: Гілевіч Н. Сталасць таленту, «Полымя», 1959, № 4; Арочка М. Песня шчырасці і роздуму, там жа, 1965, № 5; Лойка А. Зайдзі ў мой дом, там жа, 1967, № 9.*А. А. Лойка.* Мінск.

ДЗЯРЖАВА, паліт. арганізацыя эканамічна пануючага класа для падаўлення супраціўлення яго класавых праціўнікаў. «Дзяржава — гэта ёсць машына для падтрымання панавання аднаго класа над другім» (Ленін У. І. Тв., т. 29, с. 442). Ва ўмовах сацыялізма — паўнаўладдзе працоўных, сродак пабудовы бясклаcавага камуніст. грамадства.

Гісторыя ведае тры тыпы эксплуататарскай Дз.: рабаўладальніцкую, феадальную і буржуазную. Пераход ад аднаго тыпу эксплуататарскай Дз. да другога, гістарычна больш высокага, ажыццяўляўся ў выніку змены грамадска-эканам. фармацый, што выклікала паяўленне новых антаган. класаў, новых формаў эксплуатацыі і класавага панавання. Форма эксплуататарскай Дз. вызначаецца ўмовамі эканам. развіцця грамадства, суадносінамі і расстаноўкай класавых сіл, характарам класавых супярэчнасцей у пэўнай краіне і на міжнар. арэне, а таксама гістар. асаблівасцямі развіцця народа і яго нац. традыцыямі. Аднаму і таму ж тыпу эксплуататарскай Дз. ўласцівыя розныя формы праўлення (манархічная, рэспубліканская), дзярж. лад (простая або унітарная, федэратыўная або саюзная), розныя метады кіравання (адкрыта тэрарыстычныя або замаскіраваныя дэмакр. інстытутамі). Але любая эксплуататарская Дз. пры любой форме праўлення і дзярж. ладу на любой ступені свайго развіцця — апарат насілля, з дапамогай якога эксплуататарская меншасць ажыццяўляе панаванне, дыктатуру над большасцю, якая эксплуатуецца.

Якасна новы тып Дз.— сацыялістычная, якая ствараецца ў выніку перамогі сацыяліст. рэвалюцыі. Гэта паліт. арганізацыя працоўнай большасці на чале з рабочым класам і яго авангардам — Камуніст. партыяй, сродак падаўлення эксплуататарскай меншасці, арганізатар эканам., паліт. і ідэалагічнага жыцця, будаўніцтва сацыялізма і камунізма. Прыход пралетарыяту да ўлады карэнным чынам зменьвае сацыяльнае прызначэнне Дз., якая ў яго руках ператвараецца з інструмента ўмацавання і ўвекавечвання класавага панавання ў сродак ліквідацыі эксплуатацыі чалавека чалавекам і ўсіх прычын, што спараджаюць сац. няроўнасць.

Узнікненне Дз. абумоўлена развіццём матэрыяльнай вытворчасці, якое выклікала распад першабытнаабшчыннага ладу, паяўленне прыватнай уласнасці, маёмасную няроўнасць, раскол грамадства на антаган. класы і выявіла непрымірымасць класавых супярэчнасцей (гл. *Класы і класавая барацьба*). Акрамя гал. унутранай функцыі — арганізаванага падаўлення прыгнечаных і эксплуатуемых мас — эксплуататарская Дз. выконвае і знешнюю функцыю — расшырэнне тэрыторыі за кошт захопу чужых земляў, заваяванне і падпарадкаванне народаў інш. краін, абарона сваіх тэрыторый ад нападу. Найважнейшыя адзнакі Дз.: публічная ўлада, што мае спец. апарат кіравання і прымусу (чыноўнікі, армія, паліцыя, суд і інш.), і арганізацыя насельніцтва па тэрытарыяльным прынцыпе. Адзін з важных сродкаў ажыццяўлення дзярж. улады — права. Прававыя нормы вызначаюцца Дз., у эксплуататарскім грамадстве заўсёды выражаюць волю і інтарэсы класа эксплуататараў. Дз.— састаўная частка надбудовы (гл. *Базіс і надбудова*). У рабаўладальніцкім грамадстве існавалі разнастайныя формы праўлення: *манархія, арыстакратыя, дэмакратыя*, але сутнасць іх адна — дыктатура рабаўладальнікаў, рабы аставаліся бяспраўнымі і не лічыліся людзьмі. У феад. грамадстве таксама былі розныя формы праўлення (абсалютная манархія, саслоўная манархія, зародкі рэсп. формы праўлення ў шэрагу гарадоў), але па класавай прыродзе феад. Дз. заўсёды аставалася машынай эксплуатацыі і падаўлення прыгоннага сялянства, пазбаўленага ўсялякіх паліт. правоў, сродкам паліт. панавання феадалаў. Вялікай разнастайнасцю формаў — ад канстытуцыйнай манархіі да рэспублікі — вызначаюцца буржк. Дз. Найбольш уласцівая капіталіст. спосабу вытворчасці — буржк. дэмакр. рэспубліка, якая азначала гістар. прагрэс у параўнанні з феад. Дз. Гал. задача буржк. Дз.— забяспечыць агульныя ўмовы капіталіст. эксплуатацыі, непахіснасць прыватнакапіталіст. уласнасці і трымаць рабочы клас у непасрэднай эканам. залежнасці ад буржуазіі. Правы чалавека і яго месца ў капіталіст. грамадстве вызначаюцца цалкам яго маёмасным становішчам, а буржк. права з'яўляецца ўзведзенай у закон воляй буржуазіі. Дэмакр. формы і шыльды, што выкарыстоўваюцца буржк. Дз.,— фікцыя, падман, маскіроўка. З іх дапамогай буржуазія і яе ідэолагі імкнуцца скрыць сапраўдную сутнасць буржк. Дз. Асабліва рэакцыйны, антынародны характар буржк. Дз. набыла ў эпоху імперыялізму. Буйныя манаполіі розным шляхамі паступова падпарадкоўваюць буржк. машыну сваім узнакарыслівым інтарэсам. Адбываецца працэс зліцця дзярж. апарату з апаратам манаполій, на змену манапаліст. капіталізму прыходзіць *дзяржава-манапалістычны капіталізм*, які імкнецца да ліквідацыі нават фармальных буржк.-дэмакр. свабод, абмяжоўвае ролю прадстаўнічых устаноў (парламента), узмацняе выканаўчую ўладу, ваенна-паліцэйскія метады праўлення, забяспечваючы манаполіям неабмежаваныя правы ў эканоміцы і ў палітыцы. Буржк. Дз. ператварылася ў своеасаблівы камітэт па кіраванні справамі манаполіст. буржуазіі. Настаў крызіс, выраджэнне буржк. дэмакратыі, што выяўляецца ў тэндэнцыі да ўстанаўлення адкрытай дыктатуры манаполіст. буржуазіі (гл. *Фашызм*), у яшчэ больш бязлітасным падаўленні пралетарскага руху і нац.-вызв. барацьбы народаў, у палітыцы мілітарызму, падрыхтоўцы і развязванні новых агрэс. войнаў. Буржк. Дз. ператварылася ў тормаз эканам. і паліт. развіцця грамадства, стала гал. перашкодай грамадскага прагрэсу. Барацьба супраць усеўладдзя імперыял. манаполій — гал. задача ўсіх сіл міру, дэмакратыі і сац. прагрэсу. У сучасную эпоху ў ходзе нац.-вызв. рэвалюцый, краху калан. сістэмы імперыялізму складваюцца і развіваюцца Дз. *нацыянальнай дэмакратыі*. Іх паліт. аснова — блок усіх прагрэс. патрыят. сіл, якія змагаюцца за поўсю нац. незалежнасць, шырокую дэмакратыю, дазвядзенне да канца антыімперыялістычнай, антыфеадальнай, дэмакратычнай рэвалюцыі.

Сацыяліст. Дз. праходзіць у сваім развіцці два этапы: першы — ад заваявання ўлады пралетарыятам да поўнай і канчатковай перамогі сацыялізма; другі пачынаецца з уступлення грамадства ў перыяд будаўніцтва камунізма і заканчваецца яго поўнай пабудовай. На першым этапе сацыяліст. Дз. з'яўляецца Дз. *дыктатуры пралетарыяту*, якая праходзіць дзве стадыі развіцця: першая ахоплівае пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізма, другая адпавядае перыяду завяршэння сацыяліст. буд-ва. Без дыктатуры пралетарыяту нельга ні знішчыць эксплуататарскія класы, ні забяспечыць перамогу сацыялізма. Усталяванне дыктатуры пралетарыяту — агульная заканамернасць пры пераходзе ўсіх краін да сацыялізма. У ажыццяўленні задач дыктатуры пралетарыяту ўдзельнічае не толькі рабочы клас, але і інш. слаі працоўных, г. зн. большасць народу. Таму Дз. дыктатуры пралетарыяту — упершыню ў гісторыі сапраўды народная, рабоча-сялянская ўлада, новы, вышэйшы тып дэмакратыі — дэмакратыі для шырокіх мас працоўных. Яна прадугледжвае абмежаванне дэмакратыі толькі для эксплуататарскай меншасці, а пасля ажыццяўлення задач пераходнага перыяду ад капіталізму да сацыялізма набывае характар сапраўднага народаўладдзя. Дз. дыктатуры пралетарыяту можа мець розныя формы: Парыжская камуна, Сав. рэспубліка, нар.-дэмакр. рэспубліка і інш. Сав. Дз. і Дз. *народнай дэмакратыі* маюць адналькавы класавы змест, гэта дзве розныя формы дыктатуры пралетарыяту, але Дз. пар. дэмакратыі адрозніваецца ад сав. Дз. шматпартыйнасцю пры кіруючай ролі ў паліт. жыцці камуніст. партыі, паяўнасцю пар. фронту — грамадска-паліт. арг-цыі, што аб'ядноўвае шырокія нар. масы ў інтарэсах сацыяліст. буд-ва. Найважнейшыя функцыі Дз. дыктатуры пралетарыяту: падаўленне супраціўлення скінутых эксплуататарскіх класаў, арганізацыя сацыяліст. гаспадаркі, развіццё прадукцыйных сіл; фарміраванне сацыяліст. выт. адносін, ахова сацыяліст. уласнасці, дысцыпліна працы, кантроль за мерай працы і спажывання; кіраўніцтва культ. буд-вам, сацыяліст. выхаванне працоўных; абарона заваёў сацыялізма ад агрэсараў, барацьба за мір і мірнае суіснаванне Дз. з рознымі сац.-эканам. ладам, арганізацыя брацкага супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі сацыяліст. краін. З завяршэннем пераходнага перыяду ад капіталізму да сацыялізма адмірае функцыя падаўлення супраціўлення скінутых эксплуататарскіх класаў унутры краіны, яшчэ больш развіваюцца гасп.-арганізатарская і культ.-выхаваўчая функцыі сацыяліст. Дз., сапраўднага росквіту дасягае сацыяліст. дэмакратыя. У працэсе завяршэння буд-ва сацыялізма ажыццяўляецца перарастанне Дз. дыктатуры пралетарыяту ў *агульнанародную дзяржаву*. Агульнанар. сацыяліст. Дз.— непасрэдны працяг Дз. пралетарскай дыктатуры, якасна новы этап яе развіцця. У агульнанар. Дз. захоўваецца кіруючая роля рабочага класа. Яна гал. сродак ажыццяўлення суверэн.-гістар. місіі рабочага класа — пабудовы камуніст. грамадства; ступень на шляху да адмірання сацыяліст. дзяржаўнасці, перарастання яе ў камуніст. грамадскае самакіраванне. Умовы такога адмірання — пабудова развітога камуніст. грамадства ўнутры краіны і ператварэнне камунізма ва ўсеабдымную сусв. сістэму. Сав. Дз., якая ўзнікла ў выніку перамогі Вял. Кастр. сацыяліст. рэв., адыгрывае вял. ролю ў паступальным руху ўсіх народаў Сав. Саюза да камунізма. Яна пабудавана на аснове свабоднага саюзу свабодных нацый як федэрацыя сав. нац. рэспублік. Працоўныя Беларусі разам з інш. братнімі народамі ўпершыню ў гісторыі атрымалі сваю дзяржаўнасць (гл. асобны том *Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*).

Ідэолагі імперыял. буржуазіі імкнуцца затушаваць класавую сутнасць Дз. і ўвасабляюць розныя ідэаліст. тэорыі паяўлення і існавання Дз., абвяшчаюць яе «боскім устанаўленнем», увасабленнем «маральнай ідэі» і інш. Яны выступаюць з канцэпцыяй «Дз. ўсеагульнага дабрабыту», імкнуцца паказаць сучасную буржк. Дз. надкласавай арг-цыяй, якая служыць быццам бы «агульнаму дабру», ажыццяўляе палітыку «ўсеагульнага дабрабыту». Блізкія да яе рэфармісцкія канцэпцыі «дэмакр. сацыялізма» і рэвізіянісцкія «тэорыі», што вызначаюць буржк. Дз. як надкласавы орган, нібыта здольны забяспечыць эвалюц. пераход ад капіталізму да сацыялізма. Для апалагетыкі сучаснай буржк. Дз. шырока выкарыстоўваецца і рэфармісцкі тэзіс «чыстай дэмакратыі», які крытыкаваў У. І. Ленін у працы «Пралетарская рэвалюцыя і рэнегат Каўцкі». Сучасныя рэфармісты і рэвізіяністы следам за буржк. ідэолагамі адмаўляюць неабходнасць дыктатуры пралетарыяту, абвяшчаюць, што яна супярэчыць дэмакратыі, адкідаюць марксісцка-ленінскае палажэнне пра вырашальную ролю сацыяліст. Дз. ў будаўніцтве сацыялізма і камунізма; выказваюць тэзіс пра неабходнасць адмірання Дз. ўжо ў перыяд пераходу ад капіталізму да сацыялізма. Такія канцэпцыі маюць на мэце дэзарыентаваць працоўных і іх авангард — камуніст. партыі, паслабіць сацыяліст. Дз. і гэтым самым палегчыць імперыял. буржуазіі барацьбу супраць краін сацыялізма — апоры міру і прагрэсу народаў. Гістар. вопыт СССР і інш. сацыяліст. краін пацвярджае правільнасць марксісцка-ленінскага вучэння пра дыктатуру пралетарыяту, пра неабходнасць усебаковага ўмацавання сацыяліст. Дз., усё больш шырокага далучэння працоўных мас да кіравання яе справамі, далейшага развіцця сацыяліст. дэмакратыі як вырашальнай умовы паспяховай пабудовы сацыялізма і камунізма.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; іх жа. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Маркс К. Васемнаццатае брумера Луі Банапарта, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 1, Мн., 1951; Ленін У. І. Грамадзянская вайна ў Францыі, Мн., 1955; Ленін У. І. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 2, Мн., 1952; Ленін У. І. Задачы пралетарыяту ў нашай рэвалюцыі, Тв., т. 24 (Полн. собр. соч., т. 31); Ленін У. І. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (там жа, т. 33); Ленін У. І. Пралетарская рэвалюцыя і рэнегат Каўцкі, Тв., т. 28 (там жа, т. 37); Ленін У. І. Аб дзяржаве, Тв., т. 29 (там жа, т. 39); Ленін У. І. Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме, Тв., т. 31 (там жа, т. 41); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1968; Материалы XXIV съезда КПСС, М., 1971; Программные документы борьбы за мир, демократию и социализм, М., 1964; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрв. 1969 г., Мн., 1969; 50 гадоў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Пастанова Пленума ЦК КПСС. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1967; Марксистско-ленинская общая теория государства и права. Основные институты и понятия, М., 1970; Синкорский В. М. Социалистическое государство и современный ревизионизм, Мн., 1961; Косицын А. П. Социалистическое государство. Законо-

мерности возникновения и развития, М., 1970; Каменская Н. В. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР, Мн., 1954; Маргунский С. П. Создание и упрочение белорусской государственности. 1917—1922, Мн., 1958; Лушчыцкі І. М. Савецкая дзяржава ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма, Мн., 1961.

У. М. Сікорскі. Мінск.

ДЗЯРЖАВА НАРОДНАЙ ДЭМАКРАТЫІ, форма сацыяліст. дзяржавы, якая ўсталявалася ў шэрагу краін Усходняй Еўропы і Азіі пасля паражэння фашызму ў 2-й сусв. вайне 1939—45 у выніку народна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Гл. *Народная дэмакратыя.*

ДЗЯРЖАВА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЭМАКРАТЫІ, форма паліт. арганізацыі грамадства, якая ўзнікае ва ўмовах распаду каланіяльнай сістэмы імперыялізму ў выніку развіцця нац.-вызв. руху. Гл. *Нацыянальная дэмакратыя.*

ДЗЯРЖАВІН Гаўрыла Раманавіч [3(14).7.1743, в. Кармачы ці в. Сакура Казанскай губ.— 8(20).7.1816], рускі паэт. З дварап. Займаў высокія дзярж. пасады. Пачаў друкавацца ў 1773. Стаяў на пазіцыях асветнага абсалютызму. Асуджаў грамадскія заганы, выкрываў вяльможаў («Ода да Феліцы», оды «Вяльможа», «Уладарам і суддзям»), услаўляў гераізм рус. народа (оды «На ўзяцце Ізмаіла», «На пераход Альпійскіх гор»), стварыў рэаліст. ўзоры пейзажнай і інтымнай лірыкі («Восень у час асады Ачакава», «Яўгену. Жыццё званскае»). У філас. одах («Бог», «Вадаспад») апяваў веліч чалавека. На пач. 19 ст. грамадз. матывы ў творчасці паэта знікаюць. Аўтар вершаваных драм, лібрэта опер, філас. і літ.-крытычных прац. Творчасць Дз.— этап у развіцці рус. л-ры ад класіцызму да рэалізму А. Пушкіна. У 1799 і 1800 быў на Беларусі (Віцебск, Шклоў, Лёзна), у «Запісках» (выд. 1859) пісаў пра нац. самабытнасць бел. народа.



Тв.: Стихотворения, М.—Л., 1963.

ДЗЯРЖАВІН Мікалай Севасцьянавіч [3(15).12.1877—26.2.1953], савецкі славянаznавец-філолаг, гісторык, грамадскі дзеяч. Акад. АН СССР (1931), ганаровы чл. АН БССР і Балгарскай АН. Чл. КПСС з 1945. У 1922—25 рэктар Ленінградскага ун-та, у 1931—34 дырэктар Ін-та славянаznаўства АН СССР. Старшыня Антыфашысцкага к-та сав. вучоных (1942), чл. Усеславянскага камітэта (1942—47), потым чл. Славянскага к-та СССР. Напісаў больш як 500 прац (пераважна па балг. л-ры і гісторыі Балгарыі). Узнаг. 2 ордэнамі Леніна. Дзярж. прэмія СССР 1948.

Тв.: Происхождение русского народа, М., 1944; Славяне в древности, М., 1946; История Болгарии, т. 1—4, М.—Л., 1945—48; Христо Ботев, поэт-революционер, М.—Л., 1948.

Літ.: Список трудов академика Н. С. Державина в области славяноведения (1898—1952). «Краткие сообщения Ин-та славяноведения АН СССР», 1953, в. 11.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР, адна з назваў выдавецтва *«Беларусь»* у 1921—63.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ПРАВА, сукупнасць юрыдычных нормаў, якія замацоўваюць асноўныя рысы грамадскага і дзярж. ладу, стан асобы ў грамадстве і дзяржаве, прынцыпы арганізацыі і дзейнасці дзярж. органаў. У СССР вызначае асновы сацыяліст. грамадства, якія забяспечваюць умацаванне, развіццё і ахову парадкаў у інтарэсах працоўных. Сутнасць Дз. п. абумоўлена характарам вытв. адносін, а значыць, і адносінамі ў грамадстве паміж класамі. Дз. п. як галіна сацыяліст. права адрозніваецца ад навукі Дз. п., якая вывучае гістар. ўзнікненне, развіццё і прынцыпы дзярж.-прававых адносін. Дз. п.— вядучая галіна сав. сацыяліст. права. Яно замацоўвае сацыяліст. сістэму гаспадаркі, сацыяліст. ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці, заснаваную на гэтым уладу народа ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных; забяспечвае асн. правы і свабоды сав. грамадзян, магчымасць іх удзелу ў паліт., гасп. і культурным жыцці краіны. Рэгулюе пытанні нац.-дзярж. будаўніцтва (суверэнітэт, федэрацыя, аўтаномія), выбарчага права. Замацоўвае адм.-тэр. падзел саюзных і аўт. рэспублік. На прынцыповых палажэннях Дз. п. будуюцца ўсе галіны сав. сацыяліст. права — адміністрацыйнае, фінансавае, калгаснае, грамадзянскае і інш. Сістэма дзейнага Дз. п. вызначаецца Канстытуцыяй СССР і канстытуцыямі саюзных і аўт. рэспублік. Дзярж.-прававыя адносіны рэгулююцца законамі, указамі прэзідыумаў Вярх. Савета СССР, саюзных і аўт. рэспублік, пастановамі Саветаў Міністраў і асобнымі рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных і іх выканкомаў.

Бурж. Дз. п. замацоўвае волю эксплуататараў, выгадныя і пажаданыя ім парадкі і дзярж. уладу буржуазіі. Яно фіктыўнае і лжывае, бо абмяжоўваецца толькі дэкларацыяй улады народа, яго правоў і свабод, не гарантуючы іх ажыццяўлення.

Літ.: Курс советского государственного права, т. 1—2, М., 1961—62. *А. А. Галаўко.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНАЕ СТРАХАВАННЕ Ў СССР, гл. *Страхаванне дзяржаўнае.*

ДЗЯРЖАЎНА-МАНАПАЛІСТЫЧНЫ КАПІТАЛІЗМ, форма манапаліст. капіталізму, спалучэнне сілы манаполій і бурж. дзяржавы для захавання капіталіст. ладу, забеспячэння найвышэйшага прыбытку манаполіям, вядзення барацьбы супраць рабочага і нац.-вызв. руху, краін сусв. сацыяліст. сістэмы. Дз.-м. к. не а'яўляецца новай стадыяй капіталіст. развіцця і не мяняе прыроды капіталізму (гл. Ленін У. І. Тв., т. 25, с. 415). *Манаполіі* капіталістычныя ў перыяд *агульнага крызісу капіталізму* ставяць сабе на службу эканам. і паліт. магутнасць дзяржавы: не бурж. дзяржава стаіць над манаполіямі, як сцвярджаюць бурж. ідэолагі, а, наадварот, манаполіі выкарыстоўваюць апарат дзярж. улады для свайго ўзбагачэння. Па-ранейшаму ахоўваючы інтарэсы *буржуазіі*, капіталіст. дзяржава на стадыі *імперыялізму* саўдзельнічае з манаполіямі ў вытворчасці, размеркаванні, абмене і спажыванні. Адной з формаў зрошчвання



1




2

Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР.

1. Выступленне капэлы.
2. Народны артыст СССР Р. Р. Шырма.
3. Салісты заслужаныя артысты БССР М. Р. Шуманскі (справа) і В. І. Юневіч.



3




1

Дзяржаўны народны аркестр БССР.

1. Унісон цымбалістаў.
2. Саліст заслужаны артыст БССР В. А. Буркоўіч.
3. Выступленне аркестра пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР І. І. Жыновіча.



2



3







Дзяржаўны народны хор БССР.


1. Выступленне ў заключным канцэрце Дзён культуры і мастацтва Беларускай ССР у Маскве. 1967.
2. Салістка хору заслужаная артыстка БССР. М. У. Адамейка.
3. Вакальны квартэт «Купалінка».
4. Інструментальны ансамбль.
5. Вакальна-харэаграфічная карцінка «Як той Зосі давялося».
6. «Вясновы карагод».
7. Танцавальная сюіта «Беларуская маладзёжная».












Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР.






Дзяржаўны ансамбль танца БССР.

1. «Лянок».
2. «Чардаш».
3. «Беларуская ўраджайная».
4. «Бычкі».







1



2



3



4

5



Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР.

Сцэны са спектакляў:

1. «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага. 1933.
2. «Цар Фёдар Іаанавіч» А. К. Талстога. 1946.
3. «Варвары» М. Горкага. 1952.
4. «Кароль Лір» У. Шэкспіра. 1952.
5. «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага. 1957.
6. «Каменнае гняздо» Х. Вуаліёкі. 1956.
7. «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча. 1957.



6



7

манаполій і дзяржавы з'яўляецца *асабістая унія*». Аб'ектыўная эканам. аснова ўзнікнення Дз.-м. к.— *канцэнтрацыя вытворчасці*, а таксама *канцэнтрацыя і цэнтралізацыя капіталу*, небывалы рост магутнасці манаполій, крайняе абвастрэнне невырашальнага пры капіталізме канфлікту паміж прадукцыйнымі сіламі і вытв. адносінамі (гл. *Асноўная супярэчнасць капіталізму*). Асн. формы Дз.-м. к.: дзярж. капіталіст. ўласнасць і прадпрыемніцкая дзейнасць дзяржавы; прысваенне і перараспрадзяленне дзяржавай частка нац. даходу на карысць манаполій; дзярж. «рэгуляванне» эканомікі і ля мілітарызацыя; дзярж. стымуляванне знешнеэканам. экспансіі манаполій.

Асобныя дзярж.-манапаліст. элементы з'явіліся напярэдадні 1-й сусв. вайны. У эканоміцы Беларусі панавалі буйныя сіндыкаты Расіі. Уплыў на яе развіццё рабіў замежны капітал, якому ў 1913 на тэр. Беларусі належала 19 буйных прадпрыемстваў. Дзяржаве належалі чыгункі, шпалапрапітныя прадпрыемствы, водаправод, тэлеграф, *банкі*. У 1-ю сусв. вайну з улікам прыфрантавога становішча Беларусі філіялы манаполій на яе тэр. атрымлівалі вялікія ваен. заказы, што садзейнічала зрошчванню манаполій і дзяржавы. Далейшае развіццё Дз.-м. к. ў іншых капіталіст. краінах было паскорана сусв. эканам. крызісам 1929—33 і асабліва 2-й сусв. вайной, калі прадпрыемніцкая дзейнасць імперыял. дзяржаў атрымала шырокі размах. Вял. грашовыя сродкі накіроўваліся пераважна на ваен. заказы і буд-ва дзярж. ваенных прадпрыемстваў. Была створана дзярж. сістэма рэгулявання эканомікі з удзелам прадстаўнікоў буйных манаполій, якая размяркоўвала дэфіцытную сыравіну і абсталяванне, ажыццяўляла дзярж. кантроль над цэнамі, капіталаўкладаннямі, заработнай платай, нармаваннем асабістага спажывання і г. д. У пасляваенны перыяд працэс зрошчвання манаполій і дзяржавы паглыбляецца. Бурж. дзяржава становіцца найбуйнейшым уласнікам-прадпрыемцам. У Вялікабрытаніі, Францыі, ФРГ, Італіі дзярж. прадпрыемствы даюць да 20% прамысл. прадукцыі. У ЗША дзярж. ўласнасць ацэньваецца прыкладна ў 590 млрд. долараў, або 23% нац. багацця краіны. Рост дзярж. уласнасці паскарае зліццё дзярж. апарату з манаполіямі на карысць фін. капіталу. Дзяржава накіроўвае капіталаўкладанні ў тыя галіны, якія патрабуюць вялікіх затрат (энергетыка, транспарт, навук.-даследчая работа), вызначае нізкія для манаполій цэны на дзярж. прадукцыю, дае выгадныя падрады на буд-ва дзярж. аб'ектаў, на льготных умовах здае ў арэнду дзярж. прадпрыемствы. Асн. формай умяшання бурж. дзяржавы ў эканоміку з'яўляецца дзярж. бюджэт, праз які на карысць манаполій перараспрадзяляецца значная частка нац. даходу (пераважна праз ваен. заказы, якія ва ўмовах *мілітарызму* пад уздзеяннем ваенна-прамысловага комплексу ўсё больш павялічваюцца). Узбагачэнне фін. капіталу адбываецца таксама шляхам непасрэднага крэдытавання манаполій, эмены ўзроўню банкаўскага працэнта, скрытнага скарачэння падаткаў на манаполіі шляхам паскоранай амартызацыі, падатковай скідкі на *інвестыцыі* і інш. Гэтай мэце падпарадкаваны і «антыкрызісныя» захады дзяржавы для ўмацавання рынку. Каб забяспечыць высокія цэны і попыт на прадукцыю манаполій, дзяржава купляе частку іх тавараў, скарачае ці павялічвае выпуск прадукцыі на дзярж. прадпрыемствах, ажыццяўляе «праграмаванне» эканомікі, стымулюе знешнеэканам. экспансію ў формах *знешняга гандлю, вываду капіталу*, «дапамогі» краінам, якія сталі на шлях незалежнага развіцця. Для барацьбы за рынкі збыту і сферы ўплыву ствараюцца міжнар. дзяржаўна-манапаліст. аб'яднанні (гл. *Інтэграцыя эканамічная*). У інтарэсах манаполій бурж. дзяржава ажыццяўляе мерапрыемствы на «замарожванне заработнай платы», абмяжоўвае дзейнасць прафсаюзаў. Аднак гэта яшчэ больш узмацняе барацьбу рабочага класа, якая нярэдка накіравана не толькі супраць асобных груп капіталістаў, а і супраць усёй сістэмы дзяржаўна-манапаліст. панавання.

Дз.-м. к. не вырашае, а яшчэ больш паглыбляе супярэчнасці капіталізму, узмацняе рэакцыю на ўсіх кірунках. Аснова абвастрэння супярэчнасцей — нарастанне канфлікту паміж прадукцыйнымі сіламі і вытв. адносінамі. У межах асобных імперыял. краін гэты канфлікт выяўляецца ў крайнім антаганізме паміж манаполіямі і ўсімі слаямі нацыі. Забяспечваючы высокія прыбыткі манаполіям, рост багацця на адным полюсе, Дз.-м. к. вядзе наступленне на жыццёвы ўзровень працоўных, павялічвае беднасць на другім полюсе. На ўзмацненне барацьбы працоўных за свае правы Дз.-м. к. адказвае ліквідацыяй дэмакр. свабод, устанаўленнем ваенна-паліцэйскіх рэжымаў, фашызацыяй грамадска-паліт. жыцця. У маштабе сусв. капіталіст. сістэмы канфлікт паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі выяўляецца ў антаганізме паміж імперыял. дзяржавамі і краінамі, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, паміж сусв. манаполіямі і народамі краін, якія яны эксплуатуюць. Абараняючы інтарэсы манаполій, Дз.-м. к. імкнецца пазбавіць самастойнасці гэтыя краіны адкрытай агрэсіяй, падтрымкай агрэсараў і рэакц. рэжымаў, а таксама ажыццяўленнем палітыкі *неакаланіялізму*. Астаюцца таксама супярэчнасці паміж самімі імперыял. дзяржавамі. У маштабе свету канфлікт паміж прадукцыйнымі сіламі і вытв. адносінамі выяўляецца ў барацьбе дзвюх сістэм, у якой сацыялізм паказвае поўную перавагу над капіталізмам. Не могучы перамагчы ў мірным спаборніцтве, капіталізм імкнецца вырашыць гэтую барацьбу на сваю карысць з дапамогай зброі, мілітарызацыяй эканомікі, стварэннем агрэс. блокаў, развязваннем лакальных войнаў і падрыхтоўкай да сусв. тэрмаядз. вайны. Адкрытую агрэсію, гонку ўзбраенняў Дз.-м. к. дапаўняе ўзмацненнем «халоднай вайны» і небывалай па маштабах ідэалагічнай вайной. Усё гэта паглыбляе агульны крызіс капіталізму.

Паглыбленне і абвастрэнне супярэчнасцей Дз.-м. к.— аб'ектыўна непазбежны працэс крушэння капіталізму. Размах класавай барацьбы сведчыць пра тое, што Дз.-м. к. рыхтуе суб'ектыўную перадумову сацыяліст. рэвалюцыі. Адначасова ён азначае найвышэйшую ступень аграмаджвання вытворчасці, магчымую пры капіталізме, раскрывае паразітычнасць буржуазіі, стварае апарат, неабходны для кіравання грамадскай уласнасцю, таму Дз.-м. к. «...ёсць паўнейшая матэрыяльная падрыхтоўка сацыялізма, ёсць пярэдадзень яго, ёсць тая ступенька гістарычнай лесвіцы, паміж якой (ступенькай) і ступенькай, называемай сацыялізмам, ніякіх прамежкавых ступеняў няма» (Ленін У. І. Тв., т. 25, с. 335).

Літ.: Ленін У. І. Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізму, Тв., т. 22 (Полн. собр. соч., т. 27); яго ж. Пагражаючая катастрофа і як з ёй змагацца, Тв., т. 25 (там жа, т. 34); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (там жа, т. 33); яго ж. Вайна і рэвалюцыя, Тв., т. 24 (там жа, т. 32); яго ж. Сёмая (Красавіцкая) Усерасійская канферэнцыя РСДРП(б) 24—29 крас. (7—12 мая) 1917, Тв., т. 24 (там жа, т. 31); яго ж. Аб

лозунгу злучаных штатаў Еўропы, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, ч. 1, Мн., 1961; Дакументы міжнародняй Нарады камуністычных і рабочых партый, Мн., 1969; Матэрыялы XXIV з'езду КПСС, Мн., 1971; Экономическая теория Маркса — Ленина и современный капитализм, М., 1967; Империализм и кризис мирового капитализма, М., 1968; Леонтьев Л. А. Ленинская теория империализма, М., 1969; Драгилев М. С. и Молхов Н. И. Ленинский анализ монополистического капитала и современность, М., 1970; Политическая экономия современного монополистического капитализма, т. 1—2, М., 1970; Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900—1917, Мн., 1963.

П. У. Грышановіч. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЧНАЯ ХАРАВАЯ КАПЭЛА БССР, створана ў 1940 у Беластоку як калектыў спевакоў, танцораў і музыкантаў (Беларускі ансамбль песні і танца). Заснавальнік і маст. кіраўнік да 1970 нар. арт. СССР Р. *Шырма*, танц. групай кіраваў І. Хваст. Ядро калектыву склалі былыя ўдзельнікі віленскага бел. хору студэнцкай і рабочай моладзі, арганізаванага Шырмам у 1926. У 1941 ансамбль канцэртаваў у Маскве, у Айч. вайну — на Урале, у Кузбасе, Сярэд. Азіі, у 1943 вярнуўся на Беларусь (Гомель), абслугоўваў байцоў 1-га Бел. фронту і насельніцтва вызваленых раёнаў. У 1950 рэарганізаваны ў Дзярж. хор БССР (Гродна, з 1952 у Мінску), у 1955 перайменаваны ў Дзярж. хар. капэлу БССР. Найменне акадэмічнай нададзена ў 1957. Рэпертуар складаецца пераважна з арыгінальных твораў бел. кампазітараў і апрацовак нар. песень. Капэлай выканана і большасць бел. вак.-сімф. твораў (М. Аладава, А. Багатырова, Г. Вагнера, Я. Глебава, І. Кузняцова, І. Лучанка, Ю. Семянякі і інш.). Значная ўвага аддаецца хорам і кантатна-аратарыяльным творам рус. і зах.-еўрап. класікі, кампазітараў народаў СССР. Капэла шмат гастралюе па Сав. Саюзе, у 1958 выязджала ў Польшчу. Галоўны дырыжор У. Раговіч (з 1971), хормайстры Я. Грамыка і Дз. Рулінскі, сярод салістаў: засл. артысты БССР Л. Стафанава, М. Тэадаровіч, М. Шуманскі, В. Юповіч; з калектывам была звязана дзейнасць засл. дзеячаў маст. БССР А. Кагадзеева, К. Паплаўскага, В. Роўды (хормайстры), Семянякі (канцэртмайстар). Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Смольский Б. Государственная академическая хоровая капелла БССР, Мн., 1959.

Г. І. Цітовіч. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА, прадстаўнічая заканадаўчая, але абмежаваная ў правах установа Расіі ў 1906—17, створаная царскім урадам паводле *маніфеста 17 кастрычніка 1905* пад націскам рэвалюцыі 1905—07.

Выбары ў Дз. д. былі шматступеньчатыя па 4 нераўнапраўных курыях (земляробчай, гарадской, сялянскай, рабочай); больш за палову насельніцтва пазбаўлена правоў голасу (жанчыны, вандроўныя народы, ваеннаслужачыя, каля 2 млн. рабочых-мужчын, моладзь да 25 гадоў і інш.). Рашэнні думы не мелі юрыд. сілы без зацвярджання іх *Дзяржаўным саветам*. У 1-ю Дз. д. [27.4(10.5)—8(21).7.1906, адна сесія] бальшавікі байкатавалі выбары. 2-ю Дз. д. [20.2(5.3)—2(15).6.1907, адна сесія], 3-ю [1(14).11.1907—9(22).6.1912, пяць сесій], 4-ю [15(28).11.1912—6(19).10.1917, пяць сесій] бальшавікі выкарыстоўвалі для выкрыцця палітыкі царызму, крытыкі бурж. партый, прыцягнення сялян на бок пралетарыяту, для легальнай прапаганды бальшавіцкіх ідэй (гл. *Бальшавіцкая фракцыя 4-й Дзяржаўнай думы*). Указам царскага ўрада 25.2(10.3).1917 паслядэнні Дз. д. перарваны. 27.2(12.3).1917, у час Лютаўскай рэвалюцыі, створаны контррэвалюц. Часовы к-т Дз. д., які памог сфарміраваць *Часовы ўрад*. Пад націскам нар. мас Дз. д. ліквідавана Часовым урадам 6(19).10.1917. Канцылярыі Дз. д. і яе Часовага к-та скасаваны дэкрэтам СНК 18(31).12.1917.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 1 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1)]; КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954; Калинычев Ф. П. Государственная дума в России. Сб. документов и материалов, М., 1957.

ДЗЯРЖАЎНАЯ КАПІТАЛІСТЫЧНАЯ УЛАСНАСЦЬ, гл. ў арт. *Дзяржаўны капіталізм, Уласнасць.*

ДЗЯРЖАЎНАЯ МАНАПОЛІЯ, выключнае права дзяржавы на вытворчасць і продаж некаторых тавараў. Гл. таксама *Валютная манаполія, Манаполія знешняга гандлю.*

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАРАДА, нарада ў Маскве 12—15(25—28).8.1917 прадстаўнікоў буржуазіі, памешчыкаў, генералітэту, казацтва, меншавікоў і эсэраў, скліканая ў перыяд *двоеўладдзя* бурж. Часовым урадам, каб мабілізаваць контррэвалюц. сілы для разгрому рэвалюцыі — ліквідацыі Саветаў, скасаваць грамадскія арг-цыі ў арміі, давесці імперыял. вайну да пераможнага канца і г. д.

Пасля нарады контррэвалюцыя пачала рыхтавацца да ўстанаўлення ваен. дыктатуры (гл. *Карнілаўшчына*). ЦК РСДРП(б) характарызаваў Дз. н. як змову супраць народа. У знак пратэсту супраць Дз. н. бальшавікі заклікалі пралетарыят да забастовак, якія адбыліся ў Маскве, Кіеве, Сараташе і інш. Рэзалюцыі пратэсту супраць Дз. н. прынялі на сходах друкары Мінска, рабочыя аўтамаб. майстэрняў Гомеля, чыгуначнікі Оршы.

Літ.: Ленін У. І. Чуткі аб змове, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 34).

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА, гл. ў арт. *Пазыка.*

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПОШЛІНА, гл. *Пошліна.*

ДЗЯРЖАЎНАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ УЛАСНАСЦЬ, гл. ў арт. *Грамадская сацыялістычная ўласнасць.*

ДЗЯРЖАЎНЫ АКТ НА ПРАВА КАРЫСТАННЯ ЗЯМЛЁЮ, дакумент, якім замацоўваецца права калгаса ці саўгаса карыстацца зямлёю бясплатна і бестэрмінова. Даецца райвыканкомамі ад імя дзяржавы саўгасам і калгасам, статуты якіх зарэгістраваны. Складаецца ў 2 экз., адзін з якіх даецца калгасу ці саўгасу, другі хаваецца ў райвыканкоме. У гэтым дакуменце вызначаецца агульная плошча зямлі калгаса ці саўгаса і яе межы. Даецца таксама і інш. землекарыстальнікам: рыбалавецкім гаспадаркам, каап. арг-цыям і прадпрыемствам.

Кр.: Асновы зямельнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, «Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР», 1968, № 51(1449); Зямельны кодэкс БССР, «Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў БССР», 1971, № 1, арт. 4.

ДЗЯРЖАЎНЫ АНСАМБЛЬ ТАНЦА БССР, арганізаваны ў 1959. Маст. кіраўнікі і гал. балетмайстры засл. дз. маст. БССР А. *Апанасенка* (1959—71) і нар. арт. БССР С. *Дрэчын* (з 1971). Ансамбль уключае танцавальную (55 чалавек) і аркестравую групы. У рэпертуары танцы, створаныя на аснове бел. хараграгр. фальклору («Лянок», «Бычкі», «Лявоніха», «Мяцеліца», «Беларуская рапсодыя», «Хлопцы Палесся», «Беларуская кадрыль»), танцы інш. народаў — рус., укр., малд., чэш., рум., венг., сюжэтныя пастаноўкі, у т. л. харэагр. спектакль «Беларуская партызанская», гумарыст. сцэнкі. Калектыў канцэртаваў у многіх гарадах СССР, у Чэхаславакіі, Сірыі, Ліване, ГДР, Югаславіі, Бельгіі, Галандыі, Венгрыі, Балгарыі. У ім працаваў як балетмайстар засл. арт. БССР Г. Мартынаў. Званне засл. арт. БССР атрымалі салісты балета М. Апанасенка, С. Вуячыч, В. Цюрып. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Чурко Ю. Белорусский сценический танец, Мн., 1969. *Ю. М. Чурко.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ БЮДЖЭТ, гл. *Бюджэт дзяржаўны.*

ДЗЯРЖАЎНЫ ГАНДАЛЬ, гл. *Гандаль.*

ДЗЯРЖАЎНЫ ГЕРБ БССР, гл. *Герб дзяржаўны.*

ДЗЯРЖАЎНЫ ЗНАК ЯКАСЦІ, адзіная ў СССР адзнака дзярж. атэстацыі прадукцыі на адпаведнасць яе лепшым сусв. і айч. узорам. Адпаведны дзярж. стандарт уведзены 20.4.1967. Надаецца дзярж. атэстацыйнай камісіяй да наст. атэстацыі (праз 1—3 гады). Наносіцца на прадукцыю, на яе пакоўку і тару, паказваецца ў таварасуправаджальнай дакументацыі, на ярлыках і этыкетках. На вырабы, якім нададзены Дз. з. я., павышаюцца аптовыя цэны.



На 1.1.1971 дзярж. атэстацыю прайшлі 103 віды прадукцыі БССР. Сярод вырабаў, якім нададзены Дз. з. я., аўтамабіль БелАЗ-540, трактары МТЗ-50 і МТЗ-52, трактарныя рухавікі Мінскага маторнага з-да (2 мадэлі), плоскашліфавальныя станкі асабліва высокай дакладнасці (2 мадэлі) Аршанскага з-да «Чырвоны барацьбіт», бясцэнтравыя круглашліфавальныя станкі Віцебскага з-да імя Кірава, нафтавыя секцыйныя помпы Бабруйскага машынабудаўнічага з-да імя Леніна, а таксама вырабы лёгкай, мяса-малочнай, кандытарскай і інш. галін вытворчасці.

Літ.: Общие методические указания о проведении Государственной аттестации качества промышленной продукции, М., 1969. *У. А. Лібо.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ КАМІТЭТ АБАРОНЫ, дзяржаўны орган, створаны 30.6.1941 паводле рашэння Прэзідыума Вярх. Савета СССР, ЦК ВКП(б) і СНК СССР у сувязі з надзвычайным становішчам у Вял. Айч. вайну, каб мабілізаваць сілы для адпору фаш. Германіі. Старшыня І. В. Сталін. Распараджэнні Дз. к. а. былі абавязковыя для сав., дзярж., парт., ваен., гасп., прафсаюзных органаў і ўсіх грамадзян. Скасаваны 4.9.1945.

ДЗЯРЖАЎНЫ КАПІТАЛІЗМ, 1) у капіталіст. краінах — непасрэдны ўдзел дзяржавы ў эканоміцы краіны ў інтарэсах нац. буржуазіі. Аснова — дзярж. капіталіст. ўласнасць на сродкі вытворчасці: прамысловыя, транспартныя, энергетычныя прадпрыемствы, шляхі зносін і сувязь, зямельныя і лясныя ўгоддзі, узбраенне, грашовыя сродкі ў выглядзе даходаў дзярж. бюджэту і ўкладаў у дзярж. крэдытныя ўстановы. Гал. шлях утварэння дзярж. уласнасці — буд-ва аб'ектаў дзяржавай і *нацыяналізацыя*. Дзяржава з'яўляецца таксама саўладальнікам змешаных прадпрыемстваў, пабудаваных разам з капіталістамі або з фірмамі. Скандэнтраваўшы вял. сродкі, дзяржава дае капіталістам субсідыі, танны крэдыт, заказы на іх прадукцыю і інш. Дз. к. не мяняе прыроды капіталізму, бо ва ўмовах дыктатуры буржуазіі дзярж. ўласнасць — разнавіднасць прыватнакапіталіст. уласнасці, а бурж. дзяржава — сукупны капіталіст-эксплуататар. Дз. к. садзейнічае ўзбагачэнню прадпрыемцаў, канцэнтрацыі вытворчасці і капіталу, стварэнню манаполій. У імперыяліст. краінах набывае характар *дзяржаўнаманапалістычнага капіталізму.*

2) У краінах, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, Дз. к.— эканам. ўклад, на сучасным этапе пераважна накіраваны на ўмацаванне нац. гасп. і эканам. незалежнасці ад замежных манаполій. Дзярж. сектар у гэтых краінах утвараецца шляхам нацыяналізацыі ўласнасці замежных манаполій, найб. важных прадпрыемстваў, устаноў і галін гасп., канфіскацыі ўласнасці нац. здраднікаў, а таксама шляхам буд-ва новых прадпрыемстваў. Садзейнічае пераадоленню феад. пражыткаў, стварае ўмовы для некапіталіст. шляху развіцця гэтых краін. Пры пэўных умовах можа быць выкарыстаны нац. буржуазіяй і замежнымі манаполіямі, каб захаваць і ўмацаваць сваё панаванне.

3) У пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізма — форма падпарадкавання прыватнакапіталіст. прадпрыемстваў дыктатуры пралетарыяту для забеспячэння перамогі сацыяліст. эканомікі. У СССР існаваў у форме канцэсій, змешаных акцыянерных гандл.-прамысл. т-ваў і арэнды дзярж. прадпрыемстваў капіталістамі. Як грамадска-эканам. ўклад быў часовай з'явай і займаў пязначнае месца ў эканоміцы краіны (у 1923—24 яго ўдз. в. ў валавой прадукцыі не перавышае 1%). У БССР атрымаў некаторае развіццё ў форме арэнды, пераважна ў сферы гандлю. У розных формах Дз. к. быў пашыраны ў інш. сацыяліст. краінах: дзярж. кіраванне прыватнымі прадпрыемствамі (Венгрыя), дзярж.-прыватныя прадпр. і змешаныя т-вы (Балгарыя, Румынія, КНР), дзярж. кіраванне банкамі, страхавымі т-вамі, уласнасцю асоб, якія пакінулі краіну (Польшча, Чэхаславакія), здача ў арэнду дзярж. прадпрыемстваў (Польшча, Румынія) і інш.

Літ.: Ленін У. І. Пасяджэнне ВЦВК 29 красавіка 1918 г., Тв., т. 27, с. 261—278 (Полн. собр. соч., т. 36, с. 254—264); Яго ж. Аб харчовым падатку, Тв., т. 32 (там жа, т. 43); Яго ж. III кангрэс Камуністычнага Інтэрнацыянала 22 чэрвеня — 12 ліпеня 1921 г., Тв., т. 32, с. 466—467 (там жа, т. 44, с. 48—49); Мировая экономика, 2 изд., М., 1969; Троицкая Ф. Государственный капитализм в развивающихся странах, «Экономические науки», 1968, № 4; Юферева Е. Использование государственно-капиталистических форм в экономике европейских социалистических стран, там жа. *В. А. Вайцяхоўскі.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ КРЭДЫТ, гл. ў арт. *Крэдыт.*

ДЗЯРЖАЎНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ БССР, рэспубліканскі музей выяўленчага мастацтва.

Засн. ў Мінску ў 1939 (да 1957 Дзярж. карціннай галерэя БССР). Аснову калекцыі склалі творы бел., рус. і замежных мастакоў, а таксама вырабы дэкар.-прыкладнога мастацтва, якія да Кастр. рэв. знаходзіліся ў прыпатнай уласнасці буйных бел. магнатаў. У Айч. вайну музей разрабаваны ням.-фаш. захопнікамі. Пасля вайны знойдзена і вернута невялікая колькасць экспанатаў. Музей зноў адкрыты ў 1945 пасля стварэння новых фондаў (у 1957 перавезены ў спец. будынак; праект арх. М. Бакланава).

У экспазіцыі і ў фондах музея больш за 12 тыс. твораў. Вялікая калекцыя бел. мастацтва 16—20 ст.: абразы, стараж. драўляная скульптура, вырабы прыкладнога мастацтва, сабраныя супрацоўнікамі музея ў час экспедыцый; жывапіс, скульптура, графіка дарэвалюц. часу (творы І. Аляшкевіча, Л. Гараўскага, С. Заранкі, Ф. Рушчыца, І. Хруцкага і інш.). Найб. поўна паказана ў музеі творчасць бел. сав. мастакоў, у т. л. А. Абрамавай, З. Азгура, А. Анікейчыка, Л. Асецкага, І. Ахрэмчыка, А. Бембеля, В. Бялыніцкага-Бірулі, С. Вакара, В. Волкава, Н. Воранава, А. Глебава, В. Грамыкі, А. Грубэ, Л. Гумілеўскага, М. Данцыга, Я. Зайцава, А. Засіцкага, К. Касмачова, А. Кашкурэвіча, Р. Кудрэвіч, А. Малішэўскага, А. Марыкса, У. Мурахвера, С. Нікалаева, Я. Нікалаева, В. Палійчука, Г. Паплаўскага, А. Паслядовіч, М. Савіцкага, С. Селіханава, В. Цвіркі, Я. Чамадурава, Л. Шчамелева, А. Шыбнёва і інш. У экспазіцыі музея творы рус. мастацтва 18 — пач. 20 ст.: Дз. Лявіцкага, У. Баравікоўскага, Р. Угрумава, А. Ласенкі, В. Пярова, І. Рэпіна, В. Сурыкава, В. Васняцова, В. Верашчагіна, І. Шышкіна, В. Паленава, І. Левітана, М. Урубеля, А. Галавіна, Ф. Малявіна, Л. Туржанскага, П. Трубяцкога, М. Рорыха, М. Сапунова, С. Канёнкава. У музеі творы майстроў рус. савецкага мастацтва: М. Андрэева, І. Грабара, А. Герасімава, С. Герасімава, А. Бубнава, П. Канчалоўскага, І. Машкова, С. Малюціна, В. Мухінай, Г. Ніскага, П. Сакалова-Скаля, А. Рылова, Ю. Пімянава, К. Юона і інш.

Дз. м. м. БССР вядзе вял. навук.-даследчую і папулярызатарскую работу: наладжвае выстаўкі твораў сав. і замежных майстроў, перасоўныя выстаўкі па рэспубліцы і за яе межамі, лекцыі і экскурсіі, папаўняе фонды новымі творамі, памагае ствараць карцінныя галерэі, маст. аддзелы ў музеях рэспублікі. Выдае каталогі, альбомы, рэпрадукцыі, паштоўкі. Мае рэстаўрацыйную майстэрню. У 1970 музей наведала каля 100 тыс. чал. З 1944 дырэктар музея засл. дз. маст. БССР А. В. Алада (гл. *Аладавы*). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Жывапіс*.



Будынак Дзяржаўнага музея БССР.


Літ.: Государственный художественный музей БССР, М., 1958; Творы беларускіх мастакоў у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР, Мн., 1959; Государственный художественный музей БССР. Каталог-путеводитель, Л., 1968; Дзяржаўны мастацкі музей БССР. Кароткі даведнік, Мн., 1969.

П. М. Герасімовіч. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАЙ ССР, музей гісторыі і прыроды Беларусі. Засн. ў Мінску ў 1957. Адкрыты 2.11.1967. У 18 экспазіцыйных залах (пл. 1687 м²) і фондах (пл. 1300 м²) музея больш за 170 тыс. экспанатаў (1970). 6 аддзелаў: гісторыі першабытнаабшчыннага ладу, феадалізму, капіталізму, сацыялісту і камуністычнага будаўніцтва, прыроды.

Будынак Дзяржаўнага музея БССР.

У аддзеле прыроды калекцыі мінералаў, узоры карысных выкапняў, раслінны і жывёльны свет Беларусі, рэдкія стараж. жывёл. У аддзелах гісторыі першабытнаабшчыннага ладу і феадалізму матэрыялы з археал. раскопак стаянак, паселішчаў і могільнікаў каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў на тэр. Беларусі (Абідні, Адаменкі, Бердыжа, Добрага Бору, Юравіч), стараж. бел. гарадоў (Полацка, Турава, Ішчына, Навагрудка, Гродна, Мінска, Ваўкавыска), макеты і карціны рэканструкцыі стараж. крэпасцяў і гарадоў, матэрыялы і дакументы пра выдатныя гістар. падзеі, пра барацьбу бел. народа супраць іншаземных захопнікаў. У тэме «Айч. вайна 1812» матэрыялы пра гераічную барацьбу бел. народа з франц. акупантамі — трафейныя зброя і абмундзіраванне, карціны бітваў пад Астроўнай, Клясціцамі, Міром. Спец. стэнд прысвечаны дзейнасці дзекабрыстаў на Беларусі. Шырока паказана культура бел. народа: стараж. граматы, статуты, рэдкія рукапісныя і друкаваныя кнігі 16—17 ст. з бел. друкарняў у Вільні, Заблудаве, Гродне, Куцейне, Магілёве, Нясвіжы, Супраслі, матэрыялы пра бел. першадрукара Ф. Скарыну, працы вучоных і праязнаўцаў Беларусі, дарэвалюц. выданні бел. пісьменнікаў. Багаты этнаграф. матэрыял 17—19 ст.— прылады працы, вырабы рамеснікаў, узоры тканства, вышыўкі, вязання, разьбы па дрэве. У аддзеле капіталізму шырока адлюстраваны рэвалюц. рух на Беларусі (1861—1917), у т. л. паўстанне 1863—64 у Польшчы, на Беларусі і ў Літве і дзейнасць яго кіраўнікоў К. Каліноўскага, В. Урублеўскага, І. Хруцкага, І. Дамейкі. Ілюстрацыі да рэвалюцыі 1905—07 і з'езд РСДРП у Мінску, падзеі рэвалюцыі 1917 і Лютаўскай 1917, паказаны актыўныя ўдзельнікі рэвалюцый — уражэнцы Беларусі, дзейнасць Паўн.-Зах. і Палескага к-таў РСДРП(б), першых Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў на Беларусі.



Будынак Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

У аддзелах сацыялісту і камуністычнага буд-ва дакумент. матэрыялы і фотаздымкі пра Вял. Кастр. рэвалюцыю, праслаўленых барацьбітоў за Сав. ўладу на франтах грамадз. вайны і ў партыз. атрадах (*У. М. Азіна, І. Я. Алібегава, В. А. Аляшкевіча, А. А. Блажко, Ф. Э. Дзяржынскага, А. Ф. Мяснікова, А. Р. Салаўя, М. В. Фрунзе*); кіраўнікоў першага ўрада БССР: З. Х. Жылуновіча (*Ц. Гартнага*), А. Р. *Чарвякова*; перадавікоў вытворчасці і герояў працы першых пяцігодак. На стэндах, прысвечаных барацьбе працоўных Зах. Беларусі на чале з КПЗБ за сац. і нац. вызваленне, за ўз'яднанне з БССР, фотаздымкі дзеячаў КПЗБ: П. *Корчыка* (І. К. Лагіновіча), С. С. *Панкоўскі*, С. В. *Прытыцкага*, В. З. *Харужай*; нелегальныя газеты КПЗБ і КСМЗБ, выданні Бел. сялянска-рабочай грамады і Т-ва бел. школы, матэрыялы пра вызв. паход Чырв. Арміі ў вер. 1939. У тэме «Вял. Айч. вайна 1941—45» матэрыялы пра абарону Беларусі, удзел воінаў-беларусаў у барацьбе з ням.-фаш. акупантамі на франтах і ў партыз. атрадах, пра акупац. рэжым і злачынствы ням.-фаш. захопнікаў і вызваленне Беларусі ў ходзе Беларускай аперацыі 1944. У тэме «Развіццё эканомікі і культуры ў пасляваенны перыяд» матэрыялы пра дасягненні прамысловасці, с. гасп. і культуры БССР, узоры прамысл. прадукцыі рэспублікі, карта-схема эканам. сувязей Беларусі амаль з 90 краінамі свету; дакумент. матэрыялы, фотаздымкі Герояў Сац. Працы. У фондах музея аберагаюцца калекцыі: археалагічная, нумізматычная, этнаграфічная, мэблі, фарфору, шкла, карцін 17—18 ст.; збор актаў і грамат 16—18 ст. на бел., рус., польскай і лац. мовах, рукапісных і друкаваных кніг 16—17 ст.; рэдкія выданні твораў Маркса, Энгельса, Леніна і інш. Пры музеі навук. б-ка (12 тыс. тамоў), рэстаўрацыйная майстэрня. Філіял: гісторыка-археал. запаведнік у гар. пас. Заслаўе. У 1970 музей наведала каля 151 тыс. чал.

І. П. Загрышаў, Л. Дз.-Клок. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ НАРОДНЫ АРКЕСТР БССР, пачаў дзейнасць у 1930 як Беларускі дзярж. ансамбль нар. інструментаў. У 1937 ператвораны ў Аркестр бел. нар. інструментаў (у складзе Бел. філармоніі). У Айч. вайну загінулі інструменты і нотная б-ка аркестра, у 1945 пачалося яго аднаўленне. На чале калектыву з 1946 нар. арт. СССР І. *Жыновіч*. Цяперашняя назва з 1948. Аркестр адзіны ў краіне па складзе інструментаў, унікальны па гучанні. Асн. месца належыць цымбалам, з інш. нац. інструментаў уключаны дудкі і ліры; уваходзяць таксама баяны, флейта, габоі, кларнеты, балалайкі-кантрабасы, група ўдарных. Многія гады над кіраўніцтвам Жыновіча і К. Сушкевіча вялася работа па рэканструкцыі цымбалаў, у выніку якой дыяпазон інструмента расшырыўся да 3 актаў, уведзена поўная храматычная гама ва ўсім дыяпазоне, створана сям'я цымбалаў (прымы, альты, тэнары, басы і кантрабасы); удасканалены таксама ліры.

У рэпертуары больш за 1000 арыг. твораў і перапрацовак; яго аснову складаюць творы У. Алоўнікава, А. Багатырова, Я. Глебава, Я. Дзягцярыка, Жыновіча, Дз. Камінскага, Дз. Смольскага, Я. Цікоцкага, М. Чуркіна і інш. бел. кампазітараў. Калектыў шмат гастралюе. У 1957 удзельнічаў у конкурсе Усесаюзнага фестывалю моладзі (маладзёжны склад; Залаты медаль і званне лаўрэата) і ў VI Сусв. фестывалі моладзі (Масква), у 1967 — у канцэртах Дзён Сав. Беларусі на Сусв. выстаўцы «Экспо-67» (Манрэаль). Саліст і канцэртмайстар аркестра засл. арт. БССР В. Бурковіч. У розныя гады у аркестры працавалі нар. арт. БССР А. Астрамецкі, засл. артысты БССР С. Навіцкі, Х. Шмельдін. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Жинович И. Государственный белорусский нар. оркестр. Мн., 1958.

А. Я. Ракава. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ НАРОДНЫ ХОР БССР, заснаваны ў 1952. Нязменны маст. кіраўнік нар. арт. СССР Г. *Цітовіч*. У 1959—64 калектыў наз. Бел. дзярж. ансамблем песні і танца. Фарміруецца пераважна з удзельнікаў маст. самадзейнасці. Уключае хар., танц. і арк. групы. Спецыфіка структуры нар. хору ў падзеле на 5 вак. груп: да 4 асн. груп, уласцівых акад. мяшанаму хору, далучаецца асобная група падгалоскаў. Жаночая група хору часта выступае самастойна ў нар. традыцыі спеваў а капэла. З яе ўдзельніц сфарміраваны 2 вядомыя вак. ансамблі: актэт (існаваў да 1959; Залаты медаль і дыплом 1-й ступені на Усесаюзным і VI Сусв. фестывалях моладзі, 1957) і квартэт у складзе В. Антонавай (Прыдачынай), Н. Сушкевіч, В. Марозавай і А. Хазанавай (Залаты медаль на IX Сусв. фестывалі моладзі, 1968). Ганц. група выступае пераважна ў вак.-харэагр. кампазіцыях. У складзе арк. групы: баяны (4), балалайкі (3), цымбалы (3), скрыпка, кларнет, дудка, ударныя інструменты. Выкарыстоўваецца пераважна для акампанементу, але выступае і з самастойнымі нумарамі. У рэпертуары хору нар. песні і танцы, песні самадзейных і прафесійных кампазітараў (М. Аладава, У. Алоўнікава, А. Багатырова, Г. Вагнера, Я. Глебава, І. Куняцова, Дз. Лукаса, І. Лучанка, П. Падкавырава, Ю. Семянякі, Я. Цікоцкага і інш.). Побач з канцэртнай дзейнасцю (гастролі ў СССР, паездкі ў Польшчу, Румынію, Венгрыю, Канаду, Балгарыю, Фінляндыю, Францыю) калектыў вядзе вял. работу па запісе і апрацоўцы муз. фальклору. У кіраўніцтве: засл. дзеяч маст. БССР К. Паплаўскі, А. Бальцэвіч і інш. Балетную групу да 1970 узначальваў засл. дз. маст. БССР П. Акулёнак, з 1971 балетмайстар А. Іваноў. Званне засл. арт. БССР прысвоена ўдзельнікам хар. і танц. груп М. Адамейцы, Антонавай (Прыдачынай), Г. Аўдзеенцы, У. Кавальчуку, Марозавай, Ю. Сляпнёву. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Мухаринская Л. С. Белорусский государственный народный ансамбль песни и танца, Мн., 1959.

Л. С. Мухарынская. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ ПЛАНАВЫ КАМІТЭТ Савета Міністраў СССР (Дзяржплан СССР), агульнадзяржаўны орган Савецкага ўрада па планаванні. Створаны паводле ленінскага дэкрэта 22.2.1921. Функцыі і структура Дзяржплана СССР зменьваліся ў адпаведнасці з развіццём і задачамі сав. эканомікі. Распрацоўвае перспектыўныя планы і прагнозы развіцця нар. гасп. СССР, вывучае і ўзгадняе планы саюзных рэспублік, прадугледжвае прапарцыянальнасць у эканоміцы. У саюзных рэсп. планаванне ажыццяўляюць Дзяржпланы Саветаў Міністраў гэтых рэспублік. Гл. таксама *Планаванне народнай гаспадаркі*.

ДЗЯРЖАЎНЫ ПОЛЬСКІ ТЭАТР БССР, арганізаваны ў ліст. 1939 у Беластоку. Працаваў у Гродне з 13.3.1940 (адкрыўся спектаклем «Каварства і каханне» Ф. Шылера). Заснавальнік і маст. кіраўнік А. *Венгерка*. Акцёры: І. Бароўская, С. Бутрым, Я. Вашчаровіч, А. Венгерка, Т. Манкевіч, Б. Міхальская, У. Сташэўскі і інш. У рэпертуары: «Мараль пані Дульскай» і «Панна Малічэўская»

Г. Запольскай, «Пажыццёвае» і «Помста» А. Фрэдры, «Пігмаліён» Б. Шоў, «Жаніцьба Фігара» П. Бамаршэ, «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага. У 1941 т-р гастраляваў у Мінску. З пач. вайны спыніў дзейнасць.

Д. У. Стэльмах. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ РУСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР БССР імя М. Горкага. Створаны ў Бабруйску ў 1928 з рус. драм. трупы пад кіраўніцтвам У. Кумельскага як Ансамбль рус. драмы БССР. З 1932 наз. Дзярж. рус. драм. т-р БССР. З 1935 працаваў у Магілёве. У 1939 пераўтвораны ў Магілёўскі дзярж. рус. драм. т-р. З 1940 — у Ленінградскага тэатр. вучылішча. З пач. вайны т-р спыніў дзейнасць. Аднавіў яе як франтавы т-р у Маскве (1943). У 1944 працаваў у Магілёве, з 1945 у Гродне, з ліп. 1947 у Мінску. У 1955 прысвоена імя М. Горкага. Маст. кіраўнікамі і гал. рэжысёрамі былі засл. дз. маст. БССР У. *Кумельскі*, нар. артысты БССР Дз. *Арлоў*, В. *Галаўчынер* і В. *Фёдараў*, нар. арт. РСФСР В. *Рэдліх*, засл. дз. маст. Літ. ССР С. *Уладычанскі*, засл. арт. БССР М. *Співак* і інш., гал. мастаком засл. дз. маст. БССР А. *Грыгар'янц*. Т-р прапагандуе рус. і замежную класіку, сав. драматургію. Лепшым спектаклям уласцівы высокая культура рэжысуры, акцёрскага майстацтва і дэкар. афармлення. Сярод іх: «Ягор Булычоў і іншыя» і «Варвары» М. Горкага, «Рэвізор» М. Гогаля, «Прафесар Паляжаеў» Л. Рахманава, «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна, «Цар Фёдар Іаанавіч» А. К. Талстога, «Кароль Лір» У. Шэкспіра, «Каменнае гняздо» Х. Вуаліёкі, «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Узнятая цаліна» паводле М. Шолахава, «Марыя Сцюарт» Ф. Шылера. Трывалае месца ў рэпертуары належыць перакладным бел. творам: «Сымон Карызна» М. Зарэцкага, «Што пасеешь, тое і пажнеш» В. Палескага, «Брэсцкая крэпасць» і «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча, «Пад адным небам» і «Усяго адно жыццё» А. Маўзона. У розны час у т-ры працавалі: нар. артысты БССР Я. Карпавухаў, Р. Качаткоў, А. Кістаў, І. Шаціла, Ф. Шмакаў; засл. артысты БССР М. Аблаў, П. Нікандраў, Г. Няхрасаў, А. Савіна, Т. Трушына, В. Чэмберг, А. Шапс, А. Шкапскі. У складзе трупы (1971): нар. артысты СССР А. Клімава і Я. Палосін, нар. артысты БССР Г. Абуховіч і Р. Янкоўскі, засл. артысты БССР К. Верамейчык, Л. Весніна, В. Воінкаў, В. Захарава, М. Кузьменка, І. Лакштанава, Б. Масумян, І. Ражба, Ю. Сідараў, М. Сокал, А. Шах-Парон; артысты З. Асмалоўская, Э. Аўчыннікава, Л. Былінская, Э. Гарачы, І. Камароў, А. Кашкер, В. Краўчанка, К. Кулакоў (Рутштэйн), Ю. Ступакоў, В. Шрамчанка і інш. Гал. рэж. Ф. Шэйн, рэжысёры засл. дз. маст. РСФСР А. Даброцін, А. Смелякоў. Гал. мастак засл. дз. маст. Каз. ССР В. Галубовіч, мастак Ю. Тур. Іл. гл. на ўкл.

АСНОЎНЫЯ СПЕКТАКЛІ

1928 — «Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабыліна, «На дне» М. Горкага. 1933 — «Мой сябар» М. Пагодзіна, «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага, «Міжбур'е» Дз. Курдзіна. 1934 — «Скутарэўскі» Л. Лявонава, «Чужое дзіця» В. Шкваркіна, «Гібель эскадры» А. Карнейчука. 1935 — «Платон Крачат» Карнейчука, «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага, «Чапаеў» паводле Дз. Фурманава, «Сымон Карызна» М. Зарэцкага. 1936 — «Прафесар Мамлак» Ф. Вольфа, «Браняпоезд 14—69» У. Іванава. 1937 — «Рэвізор» М. Гогаля, «Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага, «Шалёныя грошы» А. Астроўскага, «Слава» В. Гусева, «Прафесар Паляжаеў» Л. Рахманава. 1938 — «Мачаха» А. Бальзака, «Сцежка шпіёна» А. Дзюма-сына, «Васа Жалязнова» М. Горкага, «Палаўчанскія сады» Лявонава. 1939 — «На ўсякага мудраца хапае прастаты» Астроўскага, «Каварства і каханне» Ф. Шылера, «Таня» А. Арбузава, «Ганна Карэніна» паводле Л. Талстога. 1940 — «Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна, «Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі, «Небяспечны паварот» Дж. Б. Прыстлі, «Беспасажніца» А. Астроўскага. 1945 — «Тры сястры» А. Чэхава, «Дванаццатая ноч» У. Шэкспіра. 1946 — «Жаніцьба Бялугіна» А. Астроўскага і М. Салаўёва, «Цар Фёдар Іаанавіч» А. К. Талстога, «Дзесці сонца» М. Горкага. 1947 — «Рускае пытанне» К. Сіманава, «Атэла» У. Шэкспіра. 1948 — «Хлеб наш надзённы» М. Вірты, «Апошняя ахвяра» А. Астроўскага, «Сустрэча з юнацтвам» Арбузава, «Дзесці Ванюшына» С. Найдзёнава. 1949 — «У адным горадзе» А. Сафронава, «За другім фронтам» В. Сабко, «Зялёная вуліца» А. Сурава, «На тым баку» А. Баранава, «Шчасце» паводле П. Пагленкі, «Дзядзька Ваня» Чэхава, «Хаціна дзядзькі Тома» паводле Г. Бічэр-Стоў. 1950 — «Два лагеры» А. Якабсана, «Песня нашых сэрцаў» В. Палескага, «На бойкім месцы» Астроўскага. 1951 — «Карчмарка» К. Гальдоні, «Дырэктар» С. Алёшына, «Шалёныя грошы» Астроўскага, «Разлом» Б. Лаўранёва. 1952 — «Два капітаны» паводле В. Каверына, «Варвары» М. Горкага, «Хітрамудрая закаханая» Лопэ дэ Вэгі, «Яе сябры» В. Розава. 1953 — «Шакалы» Якабсана, «Вясна ў Маскве» В. Гусева, «Пігмаліён» Б. Шоў, «Кароль Лір» Шэкспіра, «Што пасеешь, тое і пажнеш» («Песня нашых сэрцаў») Палескага, «Не называючы прозвішчаў» В. Мінко. 1954 — «Порт-Артур» паводле А. Сцяпанава, «Смерць Тарэлкіна» А. Сухаво-Кабыліна, «Фуэнтэ Авехуна» Лопэ дэ Вэгі, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча. 1955 — «Гады вандраванняў» і «Домік на ўскраіне» Арбузава, «Хітрыкі Скапіна» Мальера, «Персанальная справа» А. Штэйна, «Звычайны чалавек» Л. Лявонава. 1956 — «Мёртвая хватка» Дж. Голсуарсі, «Доктар» Б. Нушыча, «Мяшчане» М. Горкага, «Права на шчасце» І. Дорскага, «Гандляры славаю» М. Паньёля і Ніва, «Каменнае гняздо» Х. Вуаліёкі. 1957 — «Пагоны візіт» С. Дубравіна, «Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага, «Калі цвіце акацыя» М. Вінніка, «Галоўная стаўка» Губарэвіча. 1958 — «Цар Патап» Капкова, «Васа Жалязнова» М. Горкага, «Далі неабсяжныя» Вірты, «Мая сям'я» Э. дэ Філіпа, «Блудны сын» Э. Ранета, «Далёкая дарога» Арбузава. 1959 — «Подзвіг становіцца вядомы» Р. Раманава, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Дзікуны» С. Міхалкова, «Мы таксама не анёлы» К. Фехер, «І адзін у полі воін» паводле Ю. Дольд-Міхайліка. 1960 — «Чацвёра пад адным дахам» М. Смірновай і М. Крайндзель, «Іркуцкая гісторыя» Арбузава, «Улада цемры» Л. Талстога, «Венецыянскія блізняты» Гальдоні. 1961 — «Дванаццатая гадзіна» Арбузава, «Акіян» А. Штэйна, «Праводзіны белых начэй» В. Пановай, «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна, «Адзін год» Ю. Германа. 1962 — «Беспасажніца» А. Астроўскага, «Пад адным небам» А. Маўзона, «Матухна Кураж і яе дзеці» Б. Брэхта, «Дзень нараджэння Тэрэзы» Г. Мдывані, «Чорныя птушкі Пагодзіна. 1963 — «Беражыце жывых сыноў» Сафронава, «Бездакорная рэпутацыя» Смірновай і Крайндзель, «Двое на арэлях» У. Гібсана, «Вечны агонь» П. Харкова, «Паварот ключа» М. Кундзеры, «Ленінградскі праспект» І. Штока, «Узнятая цаліна» паводле М. Шолахава. 1964 — «Антоній і Клеапатра» Шэкспіра, «Філумена Мартурана» Э. дэ Філіпа, «У дзень вяселля» Розава, «Пашэсце» Лявонава, «Іван-ды-Мар'я» У. Гольдфельда. 1965 — «Справа Даўбмана» Л. Кручкоўскага, «Дамора-акіяна» Ю. Петухова, «Куды ідзеш, Сяргей?» А. Маўзона, «Дзесці сонца» М. Горкага, «Мая старэйшая сястра» А. Валодзіна. 1966 — «Салдат і Ева» Н. Барысавай, «Маскарад» М. Лермантава, «Фізікі-лірыкі» Я. Волчака, «Шостага лівеня»

М. Шатрова, «Вяселле на ўсю Еўропу!» А. Арканава і Р. Горына, «Снежная каралева» Я. Шварца. 1967 — «Звычайная гісторыя» паводле І. Ганчарова, «Любоў Яравая» К. Транёва, «Шчыт і меч» паводле В. Кажэўнікава, «Захавай маю тайну» Сабко. 1968 — «Варшаўская мелодыя» Л. Зорына, «Дзеля жыцця» Губарэвіча, «Помста Палавінкіна» М. Гарулёва, «Яшчэ не вечар» Пановай, «Дурнічка» Лопэ дэ Вэгі, «Фініст — Ясны Сокал» С. Маршака і Васільевай. 1969 — «Рупіны страляюць на ўпор» паводле І. Новікава, «Уврост расплаты» Л. Жухавіцкага, «Усяго адно жыццё» А. Маўзона, «Падарожнік без багажу» Ж. Ануя. 1970 — «Марыя Сцюарт» Ф. Шылера, «Марыя» Салынскага, «Вораві» М. Горкага, «З вечара да поўдня» Розава. 1971 — «Разгром» паводле А. Фадзеева.

Літ.: Бурьян Б. И. и Лисневский И. Е. На театральных перекрестках, Мн., 1967; Яфёд У. І. Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР, у кн.: Мастацтва Савецкай Беларусі, Мн., 1955. *Б. І. Бур'ян.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ САВЕТ, у дарэвалюцыйнай Расіі заканадарадчы орган (1810—1906) і верхняя заканадаўчая палата (1906—17). Складаўся з саноўнікаў, прызначаных царом, і міністраў, якія былі членамі Дз. с. па пасадзе. Разглядаў законапраекты, штаты ўстаноў, кашгарысы даходаў і расходаў, статуты таварыстваў і інш. Роля Дз. с. была нязначная, нават уняслення законапраекта на абмеркаванне залежала ад волі цара. Рэарганізаваны ў 1906 у сувязі са стварэннем *Дзяржаўнай думы*. Фармальна атрымаў заканадаўчае права, разглядаў і зацвярджаў законы, якія абмяркоўваліся ў Дзярж. думе. Цар мог адхіліць любы закон, зацверджаны Дз. с. Палову членаў Дз. с. прызначаў цар, астатнія выбіраліся на аснове высокага маёмаснага цэнзу. Гэта забяспечвала перавагу ў Дз. с. буйным землеўладальнікам, прамыслоўцам, гандлярам, духавенству.

Літ.: Ерошкин Н. П. Очерки истории государственных учреждений дореволюционной России, М., 1960.

«ДЗЯРЖАЎНЫ САЦЫЯЛІЗМ», бурж. тэорыя, паводле якой некаторыя сац.-эканам. мерапрыемствы капіталіст. дзяржаў выдаюцца за сацыялізм. пераўтварэнні, тым самым сцвярджаецца перараджэнне капіталізму, перарастанне яго ў сацыялізм. Мэта — аслабіць уплыў марксізма, адцягнуць увагу рабочага класа і ўсіх працоўных капіталіст. краін ад рэвалюц. барацьбы.

Найб. пашырыўся ў 19 ст. ў Германіі (Л. Штэйн, К. Радбертус-Ягецаў, А. Вагнер). К. Маркс і Ф. Энгельс характарызавалі яго як «каралеўска-прускі ўрадавы сацыялізм» (гл. Соч., т. 16, с. 79). Гэтую тэорыю выкарыстоўвалі ў мілітарысцкіх мэтах фашысцкія ўрады Германіі і Італіі. На сучасным этапе яна затушоўвае супярэчнасці *дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму* і па сутнасці поўнасцю змыкаецца з «дэмакратычным сацыялізмам» — тэорыяй англ. лейбарыстаў і правых сацыялістаў (К. Этлі, Г. Ласкі, Г. Морысан і інш.). У бурж. нацыяналізацыі некат. прадпр. і галін гасп. яны бачаць фундамент сацыялізма, а гаспадарчыя мерапрыемствы капіталіст. дзяржаў, накіраваныя на забеспячэнне высокага прыбытку манаполій, выдаюць за сацыяліст. планаванне. На самай справе бурж. нацыяналізацыя не мяняе эксплуататарскай сутнасці капіталіст. ладу, бо бурж. дзяржава з'яўляецца сукупным капіталістам-эксплуататарам. Прытым адначасова з бурж. нацыяналізацыяй большая частка галін вытворчасці астаецца ў руках у прыватных уласнікаў.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 10—14; Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 39 (гл. Прадметны паказальнік); Империализм сегодня, пер. с нем., М., 1968. *А. А. Гаеўскі.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР БССР, створаны ў 1930 як сімфанічны аркестр Беларускага радыёцэнтра (дырыжоры А. Міхайлаў, засл. арт. БССР А. Бяссмертны, засл. дз. маст. БССР І. Гіттарц). У 1937 увайшоў у склад Бел. філармоніі. У Айч. вайну не працаваў, у 1945 пачалося аднаўленне калектыву (першы пасляваенны канцэртны сезон адкрыты ў вер. 1946). Сучасная назва з 1961. У рэпертуары творы рус. і замежных кампазітараў-класікаў, сучасная сав. і замежная музыка. Аркестр выконвае пераважную большасць сімф. і вак.-сімф. твораў бел. кампазітараў (Л. Абеліёвіча, М. Аладава, У. Алоўнікава, А. Багатырова, Г. Вагнера, Я. Глебава, Дз. Камінскага, П. Падкавырава, Р. Пукста, Дз. Смольскага, Я. Цікоцкага, М. Чуркіна і інш.). Калектыў гастралюе па Беларусі, канцэртаваў у многіх гарадах РСФСР, Прыбалтыкі, Украіны. Гал. дырыжор у 1962—71 засл. арт. БССР В. *Катаеў*. Дырыжор Ю. Яфімаў. У розныя гады дырыжорамі аркестра былі нар. арт. СССР К. Сімяонаў, нар. арт. БССР Т. Каламійцава, засл. дз. маст. БССР М. Шпейдэрман, засл. арт. БССР І. Мусін, нар. арт. РСФСР В. Дуброўскі, засл. арт. РСФСР Б. Афанасьеў. Званне засл. арт. БССР прысвоена С. Асновічу, Н. Кірыльчанку, Г. Клачко, Б. Скабло. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Журавлев Д. Государственный симфонический оркестр Белорусской ССР, Мн., 1961.

А. Я. Ракава. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ЛЯЛЕК БССР, створаны ў 1938 і да 1948 знаходзіўся (з перапынкам у Айч. вайну) у Гомелі. Адкрыўся казкай «Па шчупаковай волі» Л. Тарахоўскай, у 1939 паказаны «Дзед і жораў» В. Вольскага. У 1950 створаны нанава і працуе ў Мінску. Складаецца з 2 творчых груп са сваім рэпертуарам і акцёрамі. Працуе на бел. і рус. мовах. У рэпертуары пераважаюць спектаклі для дзяцей, ставяцца і для дарослых. Шмат гастралюе па рэспубліцы і за яе межамі. Удзельнічаў у фестывалях т-раў лялек Прыбалтыйскіх рэспублік і Беларусі ў Таліне (1965), Рызе (1968) і Каўнасе (1971). У розны час у т-ры працавалі рэжысёры засл. арт. БССР А. Аркадзьеў, М. Бабушкін, А. Бурма, Я. Жавінскі, С. Мерзлякоў, М. Райская; мастакі засл. дз. маст. БССР Б. Звінагродскі, А. Каламійцаў; акцёры Н. Алешка, А. Аніскоўіч, С. Дзям'янава, Р. Ліпніцкі, Н. Правіст, А. Хутарэцкі і інш. У складзе трупы (1971): засл. артысты БССР У. Калашнікаў і У. Уласаў; артысты У. Грамовіч, І. Жыткевіч, В. Зельскі, А. Іванова, В. Кабелеў, М. Кала-

Сцэна са спектакля «Дзед і жораў».



дзінскі, К. Калашнікава, Л. Мікула, В. Пакрашынская, Л. Пахомава, Я. Рагачоў, С. Сцефановіч і інш. Гал. рэж. (з 1956) засл. арт. БССР А. *Ляляўскі*, рэж. В. Казлова; гал. мастак Л. Быкаў, мастак А. Фаміна.

РЭПЕРТУАР ТЭАТРА

1952 — «Вясёлыя медзведзяняты» М. Паліванай, «Зайчык-зазнайчык» С. Міхалкова, «Каштанка» паводле А. Чэхава, «Дзед і жораў» В. Вольскага. **1953** — «Канёк-Гарбунок» паводле П. Яршова, «Разумны казёл» («Казка пра казла») С. Маршака, «Пеўнік — залаты грабеньчык» К. Чарняк, «Следапыты» С. Мерзлякова, «Сярэбраны капыток» паводле П. Бажова. **1954** — «Іван — сялянскі сын» Б. Сударушкіна, «Шышка і сучок» С. Праабражэнскага, «Фініст — Ясны Сокал» М. Шастакова, «Снежная каралева» Чарняк, «Іржык-малайчына» Л. Вяпрыцкай, «Краса ненаглядная» Я. Сцяранскага. **1955** — «Сястрычка Аленка і браток Іванка» Чарняк, «РВС» паводле А. Гайдара, «Цудоўная дудка» В. Вольскага, «Прыгоды Чыпаліна» паводле Дж. Радары, «Мароз Снегавіч» В. Сурскай, «Кот у ботах» Г. Уладычнай. **1956** — «Па шчупаковай волі», «Што пасееш, тое і пажнеш» Ю. Елісеева, «Лясная хата» П. Данілава, «Чароўная лямпа Аладзіна» Н. Гернет, «Воўк-прытворшчык» Г. Ландау. **1957** — «Смеласць гарады бярэ» і «Піражок» Ландау, «Іван-царэвіч і шэры воўк» А. Бычкова, «Карлік-Нос» Чарняк, «Птушынае малако» Е. Тудароўскай і В. Мятальнікава, «Кошчын дом» Маршака, «Дзед і жораў». **1958** — «Браты Лю» А. Маляўскага, «Пунсовая кветачка» Л. Браўсевіча і І. Карнаухавай, «Слова гонару» А. Міхайлава, «Кароль-Алень» паводле К. Гоцы, «Каваль-вярнідуб» паводле А. Якімовіча. **1959** — «Алі-Баба» М. Тубяроўскага, «Казка пра загублены час» Я. Шварца, «Сняжурчына школа» Ландау. **1960** — «Кветка жыцця» А. Праўдзіной. **1961** — «Лясун» М. Алтухова, «Лянівае царства» М. Майсеевай, «Сярэбраная табакерка» паводле З. Бядулі. **1962** — «Хлопчык з Кіяк-возера» Браўсевіча, «Інданезійская казка» Б. Бахмуцкага і С. Попіка, «Марынка-крапіўніца» А. Вольскага і П. Макаля, «Прыгоды Ілзнайкі» М. Носава. **1963** — «Вясёлы цырк» А. Ляляўскага, «Зялёная лісіца» Ю. Страхава, «Заечая школа» П. Манчава, «Слон і Зося» У. Ліўшыца. **1964** — «Цвёрды арэшак» Алтухова, «Шкодны вітамін» Елісеева, «Тры парасяці» Міхалкова, «Кацьчын дзень» М. Азава і В. Ціхвінскага. **1965** — «Золушка» Т. Габэ, «Тыграня Петрык» паводле Г. Янушэўскай і Я. Вількоўскага. **1966** — «Доктар Айбаліт» В. Карастылёва, «Прыгоды Пін-Піна» Манчава. **1967** — «Ваенная тайна» паводле А. Гайдара, «Арэхавы пруток» паводле К. Груя, «Два майстры» Елісеева. **1968** — «Чортаў млын» Я. Дрды і І. Штока, «Беласнежка і сем гномаў» Л. Усцінава і А. Табакова, «Цудоўная Галатэя» С. Дарваша і Б. Гадар, «Славутае качаня Цім» Т. Амосавай і І. Пятровай. **1969** — «Бландзінае шчаня» У. Гюлы, «Вясёлы цырк», «Чароўны галёш» Г. Мацвеевай, «Ліпавічкі» паводле У. Галубка. **1970** — «Васіліса Прыгожая» Чарняк, «Казка пра маленькага Капліка» Гернет, «Апельсіны і прынц» паводле К. Гоцы, «Скарб Сільвестраў» А. Вагенштайна. **1971** — «Званы-лебедзі» Браўсевіча і Карнаўхавай, «Янка-цымбаліст і алавянае царства» Э. Брука і Б. Луцэнкі.

М. А. Каладзінскі.
Мінск.



Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР. Сцэна са спектакля «Пяе «Жаваранак».

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР МУЗЫЧНАЙ КАМЕДЫІ БССР, адкрыты ў Мінску 17.1.1971. Першыя спектаклі: гераічная муз. камедыя Ю. Семянякі «Пяе «Жаваранак», аперэты «Фіялка Манмартра» І. Кальмана, «Вольны вецер» І. Дунаеўскага, «Каўказская пляменніца» Р. Гаджыева. Гал. дырыжор засл. арт. БССР П. Кірыльчанка, рэжысёр В. Вярбоўская, гал. мастак А. Марозаў, балетмайстар-рэпетытар Э. Піно, гал. хормайстар Н. Андросава. У складзе трупы засл. артысты БССР Дз. Іванова, Л. Мацісава, В. Шаўкалюк, засл. арт. РСФСР Н. Равінская, арт. Н. Гайда.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР, створаны ў Мінску ў кастр. 1926 з выпускнікоў яўр. сектара Бел. драм. студыі ў Маскве (1921—26, педагогі А. Дзікі, В. Сахноўскі і інш.). У Айч. вайну знаходзіўся ў Новасібірску. З 1946 да крас. 1949 працаваў у Мінску. Маст. кіраўнікі — нар. артысты БССР В. *Галаўчынер* і М. *Рафальскі*. У т-ры працавалі рэжысёры засл. дз. маст. БССР Л. Літвінаў і А. Айзенберг, засл. артысты БССР Ю. Арончык, М. Моін, М. Сокал, А. Трэпель, нар. арт. УССР Б. Норд, акцёры М. Бярозкін, П. Вольпіна, Э. Герцберг, Э. Дрэйзіна, К. Кулакоў (Рутштэйн), І. Левін, Р. Цорфас, Ф. Цыпкіна, М. Чайгорская і інш. У асобных спектаклях адчуваліся фарміалістычныя захапленні, празмерныя нац. акцэнты.



Сцэна са спектакля «Вядзьмарка».

АСНОЎНЫЯ СПЕКТАКЛІ

1926 — «На пакаянным ланцугу» І. Перэца, «Свята ў Касрылаўцы» паводле Шолам-Алейхема, «Шэйлак» («Венецыянскі купец») У. Шэкспіра. **1927** — «Авечая крыніца» Лопэ дэ Вэгі, «Блукальныя зоркі» паводле Шолам-Алейхема. **1928** — «Ботвін» А. Вявюркі. **1929** — «Гоп-ля, мы жывём!» Э. Толера. **1932** — «Віндзорскія свавольніцы» Шэкспіра, «Штурм» А. Карнейчука, «Паэма пра тапор» М. Пагодзіна. **1933** — «Стрэл» А. Безыменскага. **1934** — «Інтэрвенцыя» Л. Славіна. **1937** — «Бойтра» М. Кульбака, «Фальшывая манета» М. Горкага, «Карчмарка» К. Гальдоні. **1938** — «Суламіф» С. Галкіна. **1939** — «Тэўе-малочнік» паводле Шолам-Алейхема. **1941** — «Вядзьмарка» А. Гольдфадэна. **1945** — «Так і будзе» К. Сіманава. **1946** — «200 000» паводле Шолам-Алейхема, «Пігмаліён» Б. Шоў. **1947** — «Паўстанне ў гета» П. Маркіша, «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Глыбокія карэнні» Дж. Гоў і А. Д'Юса, «Рускае пытанне» Сіманава.

М. М. Модэль.
Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ, вызначныя савецкім крымінальным законам дзеянні, якія шкодзяць найбольш важным сацыяліст.

грамадскім адносінам. Прадугледжаныя законам «Аб крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя злачынствы» (25.12.1958).

Асабліва небяспечныя Дз. з.— дзеянні, накіраваныя на падрыў або аслабленне дзярж. і грамадскага ладу, знешняй бяспекі СССР, паліт. і эканам. заваёў сацыялізма (здрада Радзіме, шпіянаж, тэрарыстычныя акты супраць прадстаўнікоў замежнай дзяржавы, дыверсіі, шкодніцтва, антысавецкая агітацыя і прапаганда, прапаганда вайны і інш.). Іншыя Дз. з.: процізаконныя дзеянні ў галіне нац. узаемаадносін, абароны краіны, аховы грамадскага парадку, эканам. жыцця (парушэнне нац. і расавага раўнапраўя; разгалашэнне дзярж. тайны; страта дакументаў, у якіх ёсць дзярж. тайна; бандытызм; дзеянні, што дэзарганізуюць работу папраўча-працоўных устаноў; кантрабанда; масавыя беспарадкі; ухіленне ад прызыву на абавязковую вайск. службу і па мабілізацыі; ухіленне ў ваенны час ад выканання павіннасцей або выплаты падаткаў; незаконны выезд за мяжу або ўезд у СССР; парушэнне правілаў міжнар. палётаў, бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту; пашкоджанне шляхоў зносін і транспартных сродкаў; фальшываманецтва і парушэнне правілаў валютных аперацый. Асобы, якія ўкрываюць дзярж. злачынцаў ці не паведамляюць дзярж. органам пра Дз. з., падлягаюць крымін. адказнасці.

Кр.: Сборник законов СССР и указов Президиума Верховного Совета СССР. 1938—1967, т. 2, М., 1968, с. 450—459.

М. А. Яфімаў. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ІНСПЕКЦЫІ, органы, якія ажыццяўляюць нагляд і кантроль за выкананнем спец. правілаў, што маюць агульнадзяржаўнае значэнне. Ствараюцца звычайна пры цэнтральных галіновых органах дзярж. кіравання (міністэрствах, дзярж. камітэтах). Выступаюць ад імя і ў інтарэсах дзяржавы. Паўнамоцтвы Дз. і. пашыраюцца на аб'екты ўсіх ведамстваў, а ў некат. выпадках — на ўсіх грамадзян.

Дзярж. інспектаванне ажыццяўляецца ў галінах: кіравання прамысловасцю (Дз. і. па прамысл. энергетыцы); аховы бяспекі і грамадскага парадку (дзярж. пажарны нагляд); кіравання с. гасп. і нарыхтоўкамі (Дз. і. па каранціне с.-г. раслін, дзярж. хлебная інспекцыя, дзярж. ветэрынарная інспекцыя); кіравання сав. гандлем (дзярж. гандлёвая інспекцыя); кіравання аховай здароўя (дзярж. санітарны нагляд); фінансаў і крэдыту, аховы прыроды (Дз. і. рыбааховы, дзярж. паляўнічая інспекцыя) і інш. Дз. і. правяраюць дзейнасць прадпрыемстваў, устаноў, арг-цый; улічваюць і аналізуюць аварыі; дазваляюць пускаць у эксплуатацыю, будаваць аб'екты; выдаюць загады, інструкцыі, правілы. Могуць ужываць да парушальнікаў сацыяліст. законнасці адм. спагнанне (штраф, грашовае налічэнне), хадайнічаць аб прыцягненні да крымін. і дысцыплінарнай адказнасці. У СССР ёсць інспекцыі ў некат. ведамствах (горнатэхнічная і інш.), якія выконваюць кантрольна-наглядныя функцыі па пэўных пытаннях і маюць права ўжываць меры адм. прымусу ў рамках міністэрства ці ведамства.

Літ.: Здир Я. А. Государственные инспекции в СССР. М., 1960; Органы государственного управления БССР. Мн., 1968.

В. І. Семянкоў. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР, узнагароды за выдатныя работы ў галіне навукі і тэхнікі, літаратуры, журналістыкі, мастацтва і архітэктуры. Устаноўлены ЦК КПБ і Саветам Міністраў БССР па літаратуры, музыцы і мастацтве 18.11.1965, па журналістыцы 19.5.1967, па архітэктуры 26.6.1968, літаратуры і мастацтве для дзяцей 7.5.1971, у галіне навукі і тэхнікі 7.5.1971. Усяго — 21 Дз. п. БССР (па 2500 руб. кожная): у галіне л-ры адна прэмія імя Янкі Купалы (за творы паэзіі і драматургіі) і адна прэмія імя Якуба Коласа (за творы прозы і літаратуразнаўства); дзве прэміі ў галіне тэатр. мастацтва, кінематаграфіі, радыё і тэлебачання; па адной — у галіне выяўл. мастацтва, у галіне музыкі, у галіне архітэктуры; адна прэмія імя Лепяшынскага (у галіне журналістыкі); адна за высокамастацкія і высокаідэйныя творы л-ры і мастацтва для дзяцей; 2 па фізіка-матэм. і фізіка-тэхн. навуках; адна па геал. і хім. навуках; 2 па біял., мед. і с.-г. навуках; адна па эканам. і грамадскіх навуках; 4 за работы па стварэнні і ўкараненні ў нар. гасп. найбольш прагрэсіўных матэрыялаў, машын і механізмаў, новых высокапрадукцыйных тэхнал. працэсаў, за ўкараненне перадавога вытворча-тэхнічнага вопыту, які мае вялікае нар.-гасп. значэнне, за арыгінальныя і эканамічныя тэхнічныя збудаванні; 2 за стварэнне арыгінальных падручнікаў для сярэдняй школы, вышэйшых і сярэдніх спец. навуч. устаноў. Утвораны (1971) Камітэт па Дзярж. прэміях БССР у галіне навукі і тэхнікі (старшыня М. А. Барысевіч) і Камітэт па Дзярж. прэміях БССР у галіне л-ры, мастацтва і архітэктуры (старшыня П. У. Броўка). Дз. п. БССР прысуджаліся штогод, з 1971 — раз у два гады (кожны цотны год) пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР па прадстаўленні Камітэтаў па Дзярж. прэміях БССР. Асобам, якія ўдастоены Дз. п. БССР, прысвойваецца званне лаўрэата Дзярж. прэміі БССР, выдаецца дыплом і нагрудны знак.

Дз. п. БССР у галіне л-ры. Імя Янкі Купалы: 1966 — Максіму Танку (Я. І. Скурко) за кнігу вершаў «Мой хлеб надзённы»; 1967 — П. Е. Панчанку за зб. вершаў «Пры святле маланкі»; 1968 — А. В. Пысіну за зб. вершаў і паэм «Твае далоні»; 1969 — П. У. Броўку за кнігі паэзіі «Заўсёды з Леніным» і «Між чырвоных рабін»; 1970 — А. А. Куляшову за пераклады кніг «Выбраная паэзія» М. Ю. Лермантава, «Энеіда» І. П. Катлярэўскага, «Спеў аб Гальваце» Генры Лангфела. Імя Якуба Коласа: 1966 — Н. Е. Пашкевічу за зб. літ.-крытычных артыкулаў «На шырокіх шляхах жыцця»; 1967 — І. П. Шамякіну за раман «Сэрца на далоні» і кнігу аповесцей «Трывожнае шчасце»; 1968 — М. Ц. Лынькову за раман «Векапомныя дні».

Дз. п. БССР імя П. М. Лепяшынскага (у галіне журналістыкі): 1968 — І. Р. Новікаву за дакументальную аповесць «Тварам да неба спекі»; 1969 — В. Палтаран (В. С. Ляпескай) за зб. нарысаў «Ключы ад сезама» і нарыс «Дзівасіл».

Дз. п. БССР у галіне выяўл. мастацтва: 1967 — В. К. Цвірку за серыю пейзажаў «На зямлі беларускай»; 1969 — М. А. Савіцкаму за карціны «Пакаранне смерцю», «Хлябы», «Рабочыя»; 1970 — А. А. Бембелю, галоўнаму мастацкаму кіраўніку праекта, А. А. Стаховічу, архітэктару, за мемарыяльны комплекс «Курган Славы».

Дз. п. БССР у галіне музыкі: 1966 — Р. Р. Шырме за канцэртна-выканаўчую дзейнасць; 1967 — І. І. Жыновічу за канцэртныя праграмы 1964—66 і выканаўчую дзейнасць; 1968 — Я. К. Цікоцкаму за оперу «Алеся»; 1969 — А. В. Багатырову за кантату «Беларускія песні»; 1970 — Я. А. Глебаву, за музыку балета «Выбранніца» і араторыю «Свяці, зара».

Дз. п. БССР у галіне тэатр. мастацтва і кінематаграфіі: 1966 — У. І. Няфёду за кнігі «Станаўленне беларускага савецкага тэатра», «Тэатр у вогненныя гады», «Сучасны беларускі тэатр»; А. З. Гутковічу (рэжысёру-пастаноўшчыку), В. А. Пранько (галоўнаму тэлевізійнаму аператару), З. Ф. Стоме (выканаўцу ролі Глушака). Л. М. Давідовіч (выканаўцы ролі Ганны), Г. М. Гарбуку (выканаўцу ролі Васіля), В. П. Тарасаву (выканаўцу ролі Яўхіма) — за тэлевізійны спектакль «Людзі на балоце»; 1967 — А. У. Спешневу (аўтару сцэнарыя і рэ-

жысёру-пастаноўшчыку), У. У. Корш-Сабліну (рэжысёру-пастаноўшчыку), П. М. Арманду (рэжысёру-пастаноўшчыку), А. А. Булінскаму (галоўнаму аператару) — за маст. фільм «Масква — Генуя»; 1968 — С. С. Казіміроўскаму (рэжысёру-пастаноўшчыку), Я. Дз. Нікалаеву (мастаку), Ф. І. Шмакаву (выканаўцу ролі У. І. Леніна) — за спектакль «Шостага ліпеня» ў Бел. дзярж. драм. тэатры імя Я. Коласа; І. Н. Вейняровічу (рэжысёру), А. С. Вялюгіну (аўтару сцэнарыя) — за хранікальна-дакументальны фільм «Генерал Пушча»; 1970 — Л. Г. Рахленку за акцёрскія работы апошніх гадоў у Беларускім дзярж. драм. тэатры імя Я. Купалы.

Дз. п. БССР у галіне архітэктуры: 1968 — Г. П. Баданаву, М. І. Баршчу, С. В. Баткоўскаму, А. П. Воінаву, У. А. Каралю, С. С. Мусінскаму, М. П. Парушнікаву, Г. В. Сысоеву, Н. Я. Трахтэнбергу, Н. А. Э. Шпігельману — за архітэктуру ансамбля цэнтр. магістралі г. Мінска — Ленінскага праспекта. *І. І. Пацяруха.* Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ СССР, узнагароды за выдатныя работы ў галіне навукі і тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Устаноўлены ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР 9.9.1966. Прысуджаюцца штогод (з 1967) у гадавіну Вял. Кастр. рэвалюцыі ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР па прадстаўленні Камітэтаў па Ленінскіх і Дзярж. прэміях СССР у галіне навукі і тэхнікі, л-ры, мастацтва і архітэктуры пры СМ СССР. Устаноўлена 60 Дзярж. прэмій СССР (50 за работы ў галіне навукі і тэхнікі і 10 за творы л-ры, мастацтва і архітэктуры) па 5 тыс. руб. кожная. У 1969 дадаткова ўстаноўлены 4 Дз. п. СССР за стварэнне высакаякасных падручнікаў для вышэйшых, сярэдніх спец. і сярэдніх навуч. устаноў, у 1970 — адна Дз. п. СССР за высокамастацкія і высокаідэйныя творы для дзяцей. Асобам, удастоеным Дз. п. СССР, прысвойваецца званне лаўрэата Дз. п. СССР, выдаецца дыплом і нагрудны знак. Лаўрэатамі Дз. п. СССР з'яўляюцца таксама асобы, якім прысуджана ў 1941—52 Сталінская прэмія (устаноўлена Пастановай СНК СССР 20.12.1939).

Дз. п. СССР у галіне навукі і тэхнікі (па БССР). 1941: С. М. Вышалескаму, правадз. чл. АН БССР, праф. Ваенна-ветэрынарнай акадэміі Чырвонай Арміі — за навук. працы па вывучэнні заразных хвароб жывёлы і за распрацоўку метадаў іх лячэння, надрукаваныя ў 1935—40 у працах Усесаюзнай акадэміі с.-г. навук імя Леніна і ў працы «Прыватная эпізааталогія», надрукаванай у 1940; М. С. Акулаву, правадз. чл. АН БССР, праф. Маскоўскага Дзярж. ун-та імя Ламаносава — за прымяненне распрацаванай ім тэорыі ферамагнетызму да дэфектаскапіі металаў. 1946: В. С. Нямчынаву, правадз. чл. АН БССР, праф. Маскоўскай с.-г. акадэміі імя Цімірязева — за навук. працу «Сельскагаспадарчая статыстыка», надрукаваную ў 1945. 1949: Г. М. Коніну, гал. канструктару Мінскага аўтамаб. з-да, ініцыятару работы, Б. У. Абухаву, М. Ю. Канэ, інжынерам таго ж з-да, В. А. Іўлеву, У. А. Іларыёнаву, Я. Я. Урынсону, І. С. Шаніра, інжынерам Яраслаўскага аўтамаб. з-да, В. Л. Дзмітрыеву, інж. Ленінградскага карбюратарнага з-да імя Куйбышава, Н. Б. Сцяпенскаму, інж. Дзярж. ўсесаюзнага ін-та аўтамаб. тэхналогіі — за стварэнне грузавога дызельнага аўтамабіля ЯАЗ-200. 1951: М. Я. Мацапуру, правадз. чл. АН БССР, І. Р. Размысловічу, навук. супрацоўніку ін-та механізацыі с. гасп. АН БССР — за распрацоўку і ўкараненне ў вытворчасць комплексу с.-г. машын і прылад для механізацыі працаёмкіх работ па вырошчванні кок-сагызу на тарфяных глебах; М. А. Безбародаву, правадз. чл. АН БССР — за манаграфіі «М. В. Ламаносаў і яго працы па хіміі і тэхналогіі сілікатаў» і «Дз. І. Вінаградаў — стваральнік рускага фарфору», надрукаваныя ў 1948—50. 1952: М. В. Патапаву, чл.-кар. АН БССР — за даследаванні ў галіне гідратэхнікі і гідраўлікі, надрукаваныя ў трох тамах у 1950—51; М. Н. Мацапуру, кіраўніку работы, правадз. чл. АН БССР, Ц. М. Бяспалаву, супрацоўніку ін-та механізацыі с. гасп. АН БССР, М. А. Ланіну, гал. канструктару з-да дарожных машын імя Сталіна, А. І. Кагас'янцу, дырэктару таго ж з-да,— за стварэнне і асваенне вытворчасці высокапрадукцыйных канавакапальнікаў для механізацыі меліярацыйных і ірыгацыйных работ. 1968: З. Л. Сіротіну, гал. канструктару, А. В. Зотаву і Г. І. Цярноўскаму, намеснікам гал. канструктара, Л. І. Добрых і Э. І. Іванову, начальнікам канструктарскіх бюро, Дз. І. Сыраквашу, гал. тэхнолагу, С. І. Грыцэнку, нам. гал. тэхнолага, І. Р. Сідаровічу, дырэктару з-да, Я. К. Слабкову, гал. інжынеру, В. І. Лук'яненку, нам. гал. інжынера, А. Я. Шітуліну, нач. цэха, работнікам Беларускага аўтамаб. з-да (Жодзіна) — за стварэнне сям'і уніфікаваных вялікагрузных аўтамабіляў для адкрытых распрацовак карысных выкапняў і будаўніцтва і за асваенне іх серыйнай вытворчасці. 1970: М. С. Высоцкаму, гал. канструктару, Л. Х. Гілелесу і М. І. Кузьміну, намеснікам гал. канструктара, Л. І. Кажушку, нам. дырэктара, І. І. Гурдусу, нам. гал. інжынера, А. Г. Выгоннаму і І. Ф. Дземідовічу, начальнікам канструктарскіх бюро, Г. І. Пазнанскаму, гал. тэхнолагу, У. В. Тарасаву, гал. металургу, В. П. Кадышэнскаму, нач. цэха, Ф. Я. Валчку, нач. корпуса, работнікам Мінскага аўтамабільнага з-да — за стварэнне канструкцыі уніфікаванай сям'і высокапрадукцыйных вялікагрузных транспартных аўтамабіляў, аўтапаязда ў аўтасамазвалаў «МАЗ-500» і арганізацыю іх вытворчасці на Мінскім аўтамабільным з-дзе; В. У. Пржыялкоўскаму, І. К. Растоўцаву, М. Е. Якельчыку, галоўным інжынерам, Г. П. Лапаце, дырэктару, Ю. У. Карпіловічу, гал. тэхнолагу, Ю. Р. Бастанджану, вядучаму інжынеру, Г. Дз. Смірнову, нам. гал. інжынера, Л. І. Шынкову, намесніку нач. цэха, М. А. Мальцаву, нач. аддзела, работнікам прадпрыемстваў Мін-ва радыёпрамысловасці, Г. К. Сталярову, загадчыку лабараторыі ін-та матэматыкі АН БССР,— за стварэнне сям'і універсальных электронных вылічальных машын другога пакалення тыпу «Мінск» і асваенне іх серыйнай вытворчасці; Д. М. Слабінскаму, нач. сектара Цэнтр. п.-д. ін-та тэхнікаэканам. даследаванняў нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці, В. В. Фёдараву, дырэктару, Д. І. Арлову, намесніку гал. інжынера, У. У. Яўстаф'еву, Ю. М. Свярдлову, галоўным інжынерам праекта, супрацоўнікам Усесаюзнага н.-д. і праектнага ін-та нафтаперапрацоўчай і нафтахімічнай прамысловасці, П. І. Караткову, дырэктару, А. П. Талаву, нач. ўстаноўкі, работнікам Полацкага нафтаперапрацоўчага з-да, А. А. Кратараву, былому дырэктару таго ж з-да, Б. З. Абросімаву, нам. дырэктара Дзярж. н.-д. і праектнага ін-та нафтавага машынабудавання, Л. М. Ашмяну, нач. Наваполацкага мантажнага ўпраўлення трэста «Нафтазаводмантаж», М. М. Аскаліну, інжынеру-тэхнолагу,— за стварэнне і прамысл. ўкараненне высокапрадукцыйнай установкі першынатчковай перапрацоўкі нафты магутнасцю 6 млн. *т* у год.

Дз. п. СССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (па БССР). 1941: А. В. Багатырову, васл. арт. БССР — за оперу «У пушчах Палесся», пастаўленую на сцэне Бел. тэатра оперы і балета; Г. П. Глебаву, нар. арт. БССР, арт. Бел. дзярж. т-ра — за вялікія дасягненні ў галіне тэатр.-драм. мастацтва; Л. П. Александроўскай, нар. арт. СССР, арт. Бел. т-ра оперы і балета,— за вялікія дасягненні ў галіне тэатр.-вакальнага мастацтва; Янку Купалу — за зб. вершаў «Ад сэрца», надрукаваны ў 1940; К. Крапіве — за п'есу «Хто смяецца апошнім», пастаўленую ў 1939. 1946: З. І. Азгуру, нар. мастаку БССР,— за скульптурныя партрэты двойчы Героя Сав. Саюза А. І. Малодчага, Героя Сав. Саюза А. І. Радзімцава, Героя Сав. Саюза М. Ф. Сільніцкага; А. К. Ільінскаму, нар. арт. БССР, Ц. М. Сяргейчыку, нар. арт. БССР, П. С. Малчанаву, нар. арт. БССР, Н. В. Лойтэру, рэжысёру, І. І. Любану, кампазітару,— за спектакль «Несцерка», пастаўлены ў Бел. т-ры імя Я. Коласа; А. А. Куляшову — за паэму «Сцяг брыгады»; Якубу Коласу — за вершы «Майскія дні», «Дарогаю славы», «Салар», «Родны шлях», «Майму другу», «На Захад», «Голас Зямлі». 1947: П. У. Броўку — за паэму «Хлеб», вершы «Думы пра Маскву», «Брат і сястра», «Народнае дзякуй», «Каб мне

стаць...», «Спатканне». 1948: Максіму Танку — за зб. вершаў «Каб ведалі»; З. І. Азгуру, нар. мастаку БССР,— за скульптурны партрэт Ф. Э. Дзяржынскага; К. М. Саннікаву, пастаноўшчыку, Г. П. Глебаву, нар. арт. БССР, Б. В. Платонаву, нар. арт. БССР, І. Ф. Ждановіч, нар. арт. БССР,— за спектакль «Канстанцін Заслонаў», пастаўлены ў Бел. т-ры імя Я. Купалы. 1949: А. А. Куляшову — за паэму «Новае рэчышча»; Якубу Коласу, нар. паэту БССР,— за паэму «Рыбакова хата». 1950: В. А. Залатарову, нар. арт. БССР, кампазітару, С. У. Дрэчыну, засл. арт. БССР, арт. балета, А. В. Нікалаевай, нар. арт. БССР, арт. балета, К. А. Мулеру, балетмайстру, С. П. Нікалаеву, нар. арт. БССР, мастаку,— за балет «Князь-возера», пастаўлены ў Бел. т-ры оперы і балета. 1951: І. П. Шамякіну — за раман «Глыбокая плынь»; П. У. Броўку — за зб. вершаў «Дарога жыцця»; К. К. Крапіве — за п'есу «Плюшч жаваранкі»; М. Ф. Садковічу, засл. дзеячу маст. БССР, рэжысёру, Г. М. Баброву, І. В. Весарабаву, аператарам,— за каляровы кінафільм «Дэмакратычная Германія». 1952: Янку Брылю — за аповесць «У Забалоцці днее»; К. М. Саннікаву, нар. арт. БССР, рэжысёру, У. І. Дзядзюшку, нар. арт. БССР, Б. В. Платонаву, нар. арт. СССР, В. М. Пола, засл. арт. БССР, Л. С. Драздовай, арт., Л. І. Ржэцкай, нар. арт. БССР,— за спектакль «Плюшч жаваранкі», пастаўлены ў Бел. т-ры імя Я. Купалы.

І. І. Пацяруха. Мінск.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ СЯЛЯНЕ, сяляне ў Расіі 18—19 ст., якія карысталіся казённай зямлёю і былі ў феад. залежнасці ад дзяржавы.

Выдзелены пры Пятры I з незапрыгоненых *чарнасошных сялян, аднадворцаў*, б. служылых людзей і інш. Пазней у Дз. с. пераведзены сяляне секулярызаваных царк. уладанняў, укр. казакі, адпушчанікі. На Беларусі і ў інш. зах. губернях, уз'яднаных з Расіяй у 1772—95, у разрад Дз. с. уключаны аднадворцы, *панцырныя баляры*, сяляне канфіскаваных маёнткаў, каланісты, вайсковыя людзі і інш.; з 1848 у Дз. с. пераведзены *вольныя хлебаробы*. У 1858 у Еўрап. Расіі Дз. с. было 9 345 342 душы мужч. полу (45,2% земляробчага насельніцтва). Яны мелі права гандляваць, мець прамысл. прадпрыемствы, уладаць «ненаселенымі» (без прыгонных сялян) землямі. У іх карыстанні ў 1858 (па 47 губернях еўрап. ч. Расіі) на душу мужч. полу было па 7,4 дзес., а ў 5 бел. губернях — па 5,1 дзес. зямлі. Дз. с. плацілі казне феад. рэнту за надзел, аброк (7,5—10 руб. з душы), падушны падатак, грошы на земскія і грамадскія патрэбы, адбывалі натуральныя павіннасці (дарожную, падводную, пастойную). Урад часам раздаваў ці прадаваў дзярж. маёнткі з Дз. с. дваранам; на Беларусі, у Прыбалтыцы, Правабярэжнай Украіне аддаваў у арэнду памешчыкам, якія прыняталі Дз. с., як і прыгонных. Збяднение і хваляванні Дз. с. вымусілі ўрад у 1837—41 правесці рэформы кіравання дзярж. вёскай, аднак гэта не садзейнічала іх гасп. ўздыму. *Сялянская рэформа 1861* не пашыралася на Дз. с. Да канца 1862 ім двойчы павялічвалі падаткі. Гэта выклікала масавыя хваляванні. У бел. і літ. губернях частка Дз. с. удзельнічала ў паўстанні 1863—64. Паводле закону ад 24.11.1866 і закону 16 мая 1867 у еўрап. губернях Расіі Дз. с. прызнаны «сялянамі ўласнікамі». Фактычна з 1867 перайшлі на выкуп надзельнай зямлі Дз. с. дзевяці зах. губерняў, у т. л. пяці беларускіх. У інш. еўрап. губернях зямлю ва ўласнасць Дз. с. атрымалі паводле закону 1886 аб абавязковым выкупе зямельных надзелаў, а ў Сібіры і Закаўказзі яны жылі на казённых землях да Кастр. рэвалюцыі.

Літ.: Дружинин Н. М. Государственные крестьяне и реформа П. Д. Киселева, т. 1—2, М.—Л., 1946—58; Зайончковский П. А. Отмена крепостного права в России, 3 изд., М., 1968.

В. А. Мілаванаў. Мінск.

ДЗЯРЖБАНК СССР, асноўнае звяно банкаўскай сістэмы СССР, эмісійны, разліковы і касавы цэнтр краіны. Заснаваны ў 1921 як Дзяржбанк РСФСР, у 1923 рэарганізаваны ў Дзяржбанк СССР. Падпарадкоўваецца Савету Міністраў СССР. Гал. функцыі: на аснове нар.-гасп. плана арганізуе і рэгулюе *грашовае абарачэнне*, ажыццяўляе крэдытаванне, разлікі ў нар. гасп., фінансаванне *капітальных укладанняў*, касавае выкананне Дзярж. бюджэту СССР (гл. *Бюджэт дзяржавы*), мабілізуе свабодныя грашовыя сродкі ў нар. гасп., распрацоўвае формы і метады гандл. і крэдытных адносін СССР з замежнымі дзяржавамі. Ажыццяўляючы гэтыя функцыі, Дзяржбанк кантралюе выкананне планаў вытворчасці і накаплення, абарачэнне тавараў, выдаткаванне прадпр. і арг-цыямі ўласных і крэдытных сродкаў мэтавага прызначэння, фондаў заработнай платы, сочыць за зніжэннем кошту буд-ва, выкананнем праектна-кашторысных, планавай, плацежнай і фінансавай дысцыпліны і тым самым садзейнічае росту вытв., тавараабароту і ўмацаванню сав. рубля.

Дзяржбанк СССР дзейнічае на аснове крэдытнага і касавага планаў. На пачатак 1971 ён меў 4148 устаноў: 166 расп., абл., краявых і гарадскіх кантор, 3793 аддаленні, 189 агенцтваў. У сістэму Дзяржбанка ўваходзіць Гал. ўпраўленне Дзярж. ашчадных кас і дзярж. крэдыту. Дзяржбанк СССР — адзін з найбуйнейшых у свеце. Працуе на гасп. разліку, мае статутны (1,5 млрд. руб.), рэзервовы і інш. фонды. У БССР на пач. 1971 было 137 устаноў Дзяржбанка, у т. л. рэспубліканская і 6 абл. кантор, 124 раённыя адд., 6 агенцтваў, якія абслугоўвалі 20 тыс. прадпр., арг-цый і ўстаноў. У 1970 імі выдадзена больш як 29 млрд. руб. кароткатэрміновага і 136 млн. руб. доўгатэрміновага крэдыту. Гл. таксама *Банкі, Крэдыт.*

Літ.: Кредитно-денежная система СССР, М., 1967; Атлас М. Развитие Государственного банка СССР, М., 1958; Очерки развития финансов и кредита в Белоруссии, Мн., 1970. *П. Я. Пчэлін.* Мінск.

ДЗЯРЖЫНСК (да 1932 Койданава), горад (з 1932), цэнтр Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. На чыг. лініі і шашы Масква — Брэст. Чыг. ст. Койданава. За 38 *км* ад Мінска. 11,5 тыс. ж. (1970).

Вядомы з 12 ст. пад назвай Крутагор'е, у складзе Мінскага ўдзельнага княства, з 13 ст.— Вял. кн. Літоўскага. Назва Койданава паходзіць, мабыць, ад імя татарскага хана Койдана (Кайдана), войскі якога быццам бы тут разбіў літ. кн. Міндоўг у 1249. З 1483 належаў кн. В. Вярэйскаму, з 1505 Гаштольдам, з 1539 каралю Жыгімонту I (Койданаўскае староства), у 1550—1831 Радзівілам (Койданаўскае графства), пазней — дзярж. маёмасць. У перыяд рэфармацыі (16 ст.) рэзідэнцыя кальвіністаў, пабудавана царква-крэпасць (17 ст.), пры ёй школа. У руска-польскую вайну 1654—67 спалены (1655). З 1793 у складзе Рас. імперыі, мяст. Мінскага пав. У Айч. вайну 1812 тут рус. войскі 3(15) ліст. разбілі атрад французаў на чале з ген. Касецкім. Паводле перапісу 1897 4744 ж. У 1865 каля мястэчка праложана чыгунка, у 1899 пабудавана запалкавая ф-ка «Дружына» (208 рабочых у 1900). У рэв. 1905—07 няраз баставалі рабочыя запалкавай ф-кі і чыгункі. 22.3.1917 створаны Савет салдацкіх дэп. і грамадскіх арг-цый. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У люг.— ліст. 1918 акупаваны войскамі кайзераўскай Германіі, у 1919—20 — бурж.-польскімі. У кастр. 1920 тут Чырв. Армія вяла цяжкія баі з польскімі акупантамі, якія спалілі большую частку мястэчка. У 1929 створана першая ў БССР МТС. У 1932 на ўшанаванне памяці Ф. Э. Дзяржынскага перайменаваны. Напярэдадні Айч. вайны тут існаваў *Дзяржынскі калгасна-саўгасны тэатр.* У гады акупацыі нямец.-фаш. захопнікамі (27.6.1941—6.7.1944) разбураны; тут дзейнічаў *Дзяржынскі антыфашысцкі камітэт.* Пасля вайны горад адбудаваны.

Прамысл. прадпрыемствы: філіял Мінскага швейнага аб'яднання імя Крупскай, мех. з-д, тэкст. ф-ка, маторарамонтны з-д, ільнозавод, малочны з-д, райпрамкамбінат, камбінат быт.



Дзяржынск. Вуліца Карла Маркса.

абслугоўвання, хлебазавод, торфапрадпрыемства «Дзяржынскае», аб'яднанне Сельгастэхнікі, інкубатарна-птушкагадоўчая станцыя. 3 сярэднія школы, школа рабочай моладзі, музычная і дзіцячая спартыўная школы, 5 дашкольных устаноў. Дом піянераў, раённая і дзіцячая б-кі, Дом культуры, кінатэатр, бальніца. Помнікі У. І. Леніну, Ф. Э. Дзяржынскаму. Помнікі: на брацкіх магілах чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1918—20 у баях з ням. і польскімі інтэрвентамі; на брацкіх магілах сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Дз.— радзіма Героя Сав. Саюза А. К. *Бурака* і А. М. *Бурака*.

На ПпУ ад Дз. гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры*. Даследавалася А. М. Ляўданскім (1928) і Э. М. Загарульскім (1963). Пазней на яго месцы ўзнікла гарадзішча эпохі Кіеўскай Русі. Пры раскопках знойдзены кераміка, стараж.-рус. шыферная прасліца (11—13 ст.) і інш. На месцы гарадзішча пабудаваны замак, які ў 16 ст. быў перабудаваны ў евангелічны храм.

Літ.: Шпілеўскі І. Ф. і Бабровіч Л. А. Гістарычны нарыс Дзяржыншчыны (Койданаўшчыны), Мн., 1932. *А. І. Валаховіч.* Мінск.

ДЗЯРЖЫНСК (да 1929 Расцяпіна), горад абл. падпарадкавання ў Горкаўскай вобл. РСФСР. Прыстань на Ацэ, чыг. станцыя. 221 тыс. ж. (1970). Перайменаваны на ўшанаванне памяці Ф. Э. Дзяржынскага. Прамысл. хім., металаапр., харчовая, буд. матэрыялаў. Камбінат мінер. угнаенняў; канатны, буд. матэрыялаў, металаканструкцый, торфабрыкетны з-ды, лесазавод, мэблевая ф-ка, мясакамбінат. Філіял Горкаўскага політэхн. ін-та; хім. і хім.-механічны тэхнікумы, муз. вучылішча. Драм. тэатр. Краязнаўчы музей.

ДЗЯРЖЫНСК (да 1925 Радзівілавічы), вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл., на р. Плаў. Цэнтр сельсавета і калгаса «На варце». За 80 *км* на З ад Лельчыц, 295 *км* ад Гомеля, 64 *км* ад прыстані Тураў на Прыпяці. 1668 ж., двароў 399 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адз. сувязі, магазін. У снеж. 1942 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ДЗЯРЖЫНСК (да 1939 Свяцоцк), вёска ў Красноўскім с/с Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 45 *км* на Пд ад Нароўлі, 223 *км* ад Гомеля, 30 *км* ад чыг. ст. Вільча (УССР). 247 ж., гасп. 83 (1971). Клуб, б-ка, швейная майстэрня, магазін. У жн. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ДЗЯРЖЫНСКАГА Ф. Э. МУЗЕЙ, адкрыты 11.9.1957 у г. п. Івянец Валожынскага р-на Мінскай вобл. У 6 экспазіцыйных залах (пл. 202,5 м²) і фондах больш за 2 тыс. экспанатаў пра жыццё і дзейнасць Ф. Э. Дзяржынскага. Дакументы і матэрыялы расказваюць пра яго дзяцінства на хутары Дзяржынава, вучобу ў 1-й Віленскай гімназіі; паказваюць Дзяржынскага як актыўнага ўдзельніка польск. і рус. рэвалюц. руху, савецкага дзярж. і парт. дзеяча.

Сярод экспанатаў «Кніга Дзераўнянскай рымска-каталіцкай прыходскай царквы пра нованароджаных у 1876—83 г.» з запісам, што ў сям'і Дзяржынскіх нарадзілася «дзіця Фелікс», партрэты бацькоў, рэчы з маёнтка Дзяржынава, макет дома, дзе прайшло дзяцінства Дзяржынскага; фотакопіі архіўных дакументаў царскай паліцыі і жандармерыі, нелегальных перыяд. выданняў, у якіх ён супрацоўнічаў; макет гектографа, на якім Дзяржынскі надрукаваў нелегальную с.-д. газ. «Robotnik Kowieński» («Ковенскі рабочы»); фотаздымкі мясцін, дзе ён жыў і вёў рэвалюц. работу. У залах музея экспанаты пра дзейнасць Дзяржынскага па ўмацаванні сав. тылу на Беларусі і Украіне (1920); у гады сацыяліст. буд-ва: электрыфікаваная карта-макет месцаў контррэвалюц. мяцяжоў, змоў і паўстанняў, раскрытых і ліквідаваных ВЧК пад яго кіраўніцтвам, фотаздымак макета дома ў



Дом-музей Ф. Э. Дзяржынскага ў Івянцы.

Мінску, дзе ён жыў у жн.— вер. 1920, фотакопіі лістоў Дзяржынскаму ад дзяцей Новарасійска, Омска, Ташкента. З жыццём і дзейнасцю Дзяржынскага знаёмяць кнігі сав. і заруб. аўтараў, творы жывапісу і скульптуры, фанатэка з запісам успамінаў, дакумент. фільмы. З дня адкрыцця музей наведала больш за 200 тыс. чалавек.

Літ.: Музей Ф. Э. Дзержинского в Ивенце (Путеводитель), Мн., 1969. *М. С. Карнеев.* Івянец.

ДЗЯРЖЫНСКАЯ ГАРА (да 1958 Святая), найвышэйшы пункт Мінскага ўзв. і Беларусі. За 30 *км* на ПдЗ ад Мінска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. Выш. 346 *м* над узр. м. Мае выгляд пакатага ўзвышэння. Складзена з марэны. Схілы пераважна разараныя, паўночныя ўкрыты мяшаным лесам.

ДЗЯРЖЫНСКІ Іван Іванавіч [н. 27.3(9.4). 1909, Тамбоў], рускі савецкі кампазітар. Засл. дзеяч маст. РСФСР (1957). Чл. КПСС з 1942. Значная роля ў развіцці сав. оперы належыць



1



2



3



4

Дзяржынскі Ф. Э. 1. Дом на хутары Дзяржынава, у якім нарадзіўся Ф. Э. Дзяржынскі. 2. Фелікс Дзяржынскі (другі злева) з маці і братамі ў маёнтку бабулі ў Ёдах. 3. Ф. Э. Дзяржынскі ў Арлоўскім катаржным цэнтрале. 1914. 4. Ф. Э. Дзяржынскі, Ю. Ю. Мархлеўскі і Ф. Я. Кон — члены Польрэўкома. Першы (злева) І. І. Скварцоў-Сцяпанаў. Ліпень 1920. 5. Ф. Э. Дзяржынскі ў рабочым кабінеце. 1922. 6. У. І. Ленін і Ф. Э. Дзяржынскі. Малюнак маст. М. М. Жукава.



5



6



1



2



3

Дом-музей I з'езду РСДРП. 1. Будынак Дома-музея I з'езду РСДРП. 2—3. Мемарыяльныя залы музея. 4. У экспазіцыйнай зале музея. 5. Генеральны сакратар Французскай кампартыі М. Тарэз і першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў каля Дома-музея I з'езду РСДРП. 1962.



4



5

яго пар.-гераічнай драме «Ціхі Дон» (1934, паст. ў Бел. т-ры оперы і балета 1938 і 1951), дзе вобраз народа атрымлівае шматгранную песенную характарыстыку. З 8 інш. опер: «Узнятая цаліна» (1937), «Князь-возера» (1947), «Далёка ад Масквы» (1954), «Навальніца» (1955), «Лёс чалавека» (1959). Аўтар 2 муз. камедый, 3 фп. канцэртаў, 2 сімфанічных паэм, рамансаў, песень, музыкі да фільмаў, тэатральных пастановак (больш за 30). Дзярж. прэмія СССР 1950. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Літ.: Томпакова О. Иван Иванович Дзержинский. Л., 1964.

ДЗЯРЖЫ́НСКІ Казімір Эдмундавіч (1875, маёнтак Еды Віленскага пав. Віленскай губ.— ліп. 1943), удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Брат Ф. Э. *Дзяржынскага.* Скончыў політэхн. ін-т у Аўстра-Венгрыі, працаваў інжынерам у Польшчы. З 1935 у маёнтку Дзяржынава Валожынскага пав. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР (1939) удзельнічаў у стварэнні мемарыяльнага музея Ф. Э. Дзяржынскага. З вясны 1943 Дз. і яго жонка Люцыя, якая ўладкавалася пераклад-чыцай у нямецкае гандлёвае таварыства ў Івянцы, наладзілі сувязь з партызанамі Баранавіцкага партызанскага злучэння. Яны перадавалі партызанам каштоўныя звесткі разведкі, што садзейнічала разгрому варожага гарнізона ў Івянцы. Гітлераўцы арыштавалі Казіміра і Люцыю і расстралялі.

Літ.: В едином строю, Мн., 1970.

А. Ф. Хацкевіч. Мінск.

ДЗЯРЖЫ́НСКІ Фелікс Эдмундавіч [парт. псеўд. Яцак, Франак, Пераплётчык, Астраном, Юзаф, Эдмунд; 30.8(11.9).1877, маёнтак Дзяржынава Ашмянскага пав. Віленскай губ.— 20.7.1926], савецкі дзярж. і партыйны дзеяч, актыўны ўдзельнік польск. і рус. рэвалюц. руху. З дробнамаянткових дварян. Чл. КПСС з 1906. У 1894 уступіў у Віленскі с.-д. гурток; у 1895 — у літоўскую с.-д. партыю (ЛСДП). З 1896 прафес. рэвалюцыянер, вёў прапаганду сярод рабочых Вільні, Коўна, кіраваў стачкамі, выдаваў нелегальную с.-д. газ. «Robotnik Kowieński» («Ковенскі рабочы»), лістоўкі, супрацоўнічаў у выданнях ЛСДП. У жн. 1899 вёў работу ў Вільні па стварэнні аб'яднанай партыі Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ), стварыў у Варшаве «Рабочы саюз сацыял-дэмакратыі». У студз. 1900 на з'ездзе СДКПіЛ у Мінску выбраны чл. ЦК. На IV з'ездзе СДКПіЛ (ліп. 1903) выбраны чл. Гал. праўлення СДКПіЛ, кіраваў арг-цыямі Польшчы і Літвы. У 1905 кіраваў першамайскай дэманстрацыяй рабочых Варшавы, арганізоўваў стачкі, праводзіў парт. сходы і канферэнцыі ў Варшаве, Лодзі, Чанстахове, Дамброўскім басейне, Беластоку, выдаваў лістоўкі, вёў рэвалюц. прапаганду сярод салдатаў. На IV (Аб'яднаўчым) з'ездзе РСДРП (1906) уведзены ў склад ЦК РСДРП як прадстаўнік СДКПіЛ. На II—IV канферэнцыях РСДРП падтрымліваў бальшавікоў. На V з'ездзе РСДРП (1907) выбраны запасны ў ЦК. У 1910—12 працаваў у парт. арг-цыях Варшавы, Чанстаховы і інш. Удзельнік нарады членаў ЦК РСДРП, скліканай У. І. Леніным (Парыж, 1911). Пасля расколу ў СДКПіЛ гал. прадстаўнік фракцыі «зажандоўцаў» (прыхільнікаў Гал. праўлення), але па многіх пытаннях стратэгіі і тактыкі разыходзіўся з Гал. праўленнем, падтрымліваў Леніна ў барацьбе з меншавікамі-ліквідатарамі. 6 разоў арыштаваны і засуджаны: у 1898 высланы ў Вяцкую губ., уцёк у 1899; у 1900 зняволены ў варшаўскай, седлецкай турмах, у 1902 уцёк па дарозе ў Сібір; у 1905 зняволены ў Варшаўскай цытадэлі, вызвалены паводле амністыі; у 1906 зняволены, у 1907 вызвалены пад заклад; у 1909 высланы на вечнае пасяленне ў Енісейскую губ., уцёк; у 1912 прыгаворапы да 3, у 1916 да 6 гадоў катаргі, вызвалены ў выніку Лют. рэв. 1917. Пасля Лютаўскай рэв. ў Маскоўскай арг-цыі бальшавікоў, адначасова кіраваў Маскоўскай групай СДКПіЛ. На VI з'ездзе РСДРП(б) падтрымаў курс партыі на ўзбр. паўстанне, выказаўся супраць яўкі Леніна на суд бурж. Часовага ўрада. Са жн. 1917 працаваў у Сакратарыяце ЦК, Выканкоме Петраградскага Савета, у ВРК. Актыўны ўдзельнік падрыхтоўкі і правядзення Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі. 16(29).10.1917 на расшыраным пасяджэнні ЦК РСДРП(б) выбраны ў Ваенна-рэвалюц. парт. цэнтр па кіраўніцтве ўзбр. паўстаннем. Пад кіраўніцтвам Дз. 25.10(7.11).1917 рабочымі і салдатамі заняты Гал. паштамт і тэлеграф. На II Усерас. з'ездзе Саветаў ад імя СДКПіЛ і польскіх рабочых вітаў перамогу рэвалюцыі; выбраны чл. ВЦВК і яго Прэзідыума. 7(20).12.1917 паводле прапановы У. І. Леніна зацверджаны старшынёй ВЧК па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам, узначальваў органы дзярж. бяспекі да канца жыцця. У гады грамадз. вайны і ваеннай інтэрвенцыі Дз. як чл. ЦК, старшыня ВЧК і нарком унутр. спраў (з сак. 1919) выконваў адказныя даручэнні ЦК партыі і Сав. ўрада. У студз. 1919 на Усх. фронце ў складзе спец. камісіі ЦК РКП(б), у маі — ліп. 1920 нач. тылу Паўд.-Зах. фронту, арганізоўваў барацьбу з бандытызмам і контррэвалюцыяй на Украіне; з ліп. 1920 на Зах. фронце як старшыня Польскага бюро ЦК РКП(б), чл. Часовага Польскага рэвалюц. к-та ў Беластоку. У жн. — вер. 1920 у Мінску як чл. РВС Зах. фронту праводзіў работу па ўмацаванні Мінскай губчэка і Асобага аддзела фронту. З 14.4.1921 нарком шляхоў зносін, адначасова старшыня ВЧК і нарком унутр. спраў. Са студз. 1921 старшыня камісіі пры ВЦВК па паляпшэнні жыцця дзяцей. З лют. 1924 старшыня ВСНГ. На VI—XIV з'ездах партыі выбіраўся чл. ЦК, а чэрв. 1924 канд. у чл. Палітбюро і Аргбюро ЦК РКП(б). На II—XII



Усерасійскіх, I—III Усесаюзных з'ездах Савецтаў выбіраўся чл. ВЦВК і ЦВК СССР. Няраз выбіраўся чл. ЦВК груп СДКПіЛ, ЦВК груп КПП у Расіі. Памёр у час пасяджэння Аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК ВКП(б). Пахаваны ў Маскве на Краснай плошчы. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Іл. гл. на ўкл.

Тв.: Избр. произв., т. 1—2, 2 изд., М., 1967; Дневник заключенного. Письма, М., 1967.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 2 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 2)]; Дзержинская С. В годы великих боев, М., 1965; Хромов С. С. По заданию Ленина. Деятельность Ф. Э. Дзержинского в Сибири, М., 1964; Яго Г. Ф. Э. Дзержинский во главе металлопромышленности, М., 1966; Софинов П. Страницы из жизни Ф. Э. Дзержинского, М., 1956; Любаров Г. М. Феликс Эдмундович Дзержинский, Мн., 1951; Тишков А. В. Первый чекист, М., 1968; Хацкевич А. Ф. Солдат великих боев. Жизнь и деятельность Ф. Э. Дзержинского, 3 изд., Мн., 1970.

А. Ф. Хацкевіч. Мінск.

ДЗЯРЖЫНСКІ АНТЫФАШЫСЦКІ КАМІТЭТ, падпольная патрыятычная арг-цыя, якая ў Айч. вайну пад кіраўніцтвам Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б узначальвала дзейнасць антыфаш. груп у Дзяржынску і Дзяржынскім р-не Мінскай вобл. Першая група з 7 чал. (арганізатары Г. В. Будай, П. М. Хмялеўскі, І. А. Жукавец) узнікла ў жн. 1941 на з-дзе «Штампоўшчык». Узніклі групы ў в. Навасёлкі, Кукшавічы. Для каардынацыі дзейнасці падпольшчыкаў прадстаўнікі груп у канцы жн. 1941 стварылі антыфаш. к-т у складзе Г. В. Будая, П. М. Хмялеўскага, І. А. Жукаўца, С. Ф. Юховіча (з вясны 1942). К-т стварыў і ўзначальваў дзейнасць антыфаш. груп у гарадской управе, бальніцы, на лесапільні, у ветлячэбніцы, у в. Ляднікі, Бакінава, Дзягільна, Макаўчыцы, Навасады, Пяняка, г. п. Негарэлае, на ст. Койданава і інш. Вёў паліт. работу па мабілізацыі сав. людзей на барацьбу з акупантамі; распаўсюджваў сярод насельніцтва і ў варожых гарнізонах лістоўкі, газ. «Звязда», зводкі Саўінфармбюро; стварыў у сак. 1942 першы ў раёне партыз. атрад імя Сталіна (камандзір С. А. Рыжак). З восені 1941 к-т падтрымліваў пастаянную сувязь з Мінскім падпольным гаркомам КП(б)Б праз У. С. *Амельянюка*. Мінскі падпольны гарком паслаў у Дзяржынск сваіх прадстаўнікоў памагчы ў арганізацыі партыз. атрада, накіраваў у атрад больш за 100 чал. К-т забяспечваў атрад звесткамі разведкі, зброяй, медыкаментамі. З лета 1942 к-т памагаў партыз. атрадам імя Будзённага, імя Фрунзе, імя Чкалава, спец. групе «Чайка», якія дзейнічалі на тэр. раёна. Падпольшчыкі выратавалі ад вывазу ў Германію больш за 400 чал. Разам з партызанамі яны ўдзельнічалі ў баявых аперацыях, знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага, падрывалі эшалоны. У кастр. 1942 фаш. захопнікі арыштавалі чл. к-та П. М. Хмялеўскага (уцёк з турмы), падпольшчыкаў М. Н. Хмялеўскага, Н. Ф. Кацяшову і А. І. Нікіціна пасля жорсткіх катаванняў загубілі; астатнія чл. к-та і многія падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. Дз. а. к. спыніў дзейнасць.

Літ.: Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы, т. 1, М., 1967, с. 662—666.


Г. В. Будай, П. М. Хмялеўскі. Мінск.


ДЗЯРЖЫНСКІ КАЛГАСНА-САЎГАСНЫ ТЭАТР, створаны ў Дзяржынску ў канцы снежня 1940 з выхаванцаў Мінскіх аднагадовых тэатр. курсаў. Маст. кіраўнік Канавалаў. У рэпертуары: «Бяда ад пяшчотнага сэрца» У. Салагуба, «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Муж усіх жонак» Ф. Коні, «Настаўнік» С. Герасімава і інш. З пач. Айч. вайны т-р спыніў дзейнасць.

ДЗЯРЖЫНСКІ РАЁН, у складзе Мінскай вобл. Утвораны 17.7.1924 (да 29.6.1932 Койданаўскі раён). Пл. 1,2 тыс. км². Нас. 48,1 тыс. ж. (1971). Падзяляецца на 10 сельсаветаў; г. п. Негарэлае. Цэнтр г. Дзяржынск.

Паўн. частка раёна занята *Мінскім узвышшам*, рэльеф сярэдне- і буйнаўзгорысты. Тут найвыш. пункт Беларусі — *Дзяржынская гара* (346 м над узр. м.). Паўд. частка раёна — *Стаўбцоўская раўніна*. Карысныя выкапні: 2 радовішчы мелу — 0,34 млн. *т* (радовішча Дзягільна 0,28 млн. *т*), 3 радовішчы цагельнай гліны — 0,5 млн. м³, 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 14,6 млн. м³ (радовішча Мазуры 14,3 млн. м³), радовішча буд. пяскоў Падсасонне 0,36 млн. м³. Паводле дадзеных метэаралагічнай ст. Негарэлае сярэдняя т-ра студз. —6,8, ліп. 17,6 °С. Ападкаў 620 мм за год. Вегет. перыяд 189 даён. Амаль уся тэр. раёна належыць да бас. Нёмана. Найб. рэкі Уса з прытокамі Ператуць (правы), Вязенская і Жэсць (левыя). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (20,2%), дзярнова-балотныя (7,2%), тарфяна-балотныя (2,2%), алювіяльныя (8,7%). З мінер. глебаў 77,6% суглінкавых, 21,8 супясчаных, 0,6 пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 53 (цана бала 0,24 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў 34, усіх с.-г. угоддзяў 49. Пад лесам 29,1% тэр. раёна. Найб. лясы на Пд і З. Пераважаюць хвоя, елка, растуць бяроза, асіна, вольха. Насяляюць раён беларусы, рускія, палякі і інш. Сярэдняя шчыльнасць нас. 40 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 27,2%. Найбольш прамысл. прадпрыемстваў у Дзяржынску; з-д жалезабетонных маставых канструкцый, рамонтны з-д дарожных машын у Фані-

Дзяржынск. Маторарамонтны завод. Рамонт трактарных рухавікоў.






палі, Негарэльскі навуч.-доследны лясгас у Гарадзішчы, Негарэльскі з-д пчолаінвентару і вашчыны, мелава-вапнавы з-д у в. Дзягільна, спіртзавод у в. Вялікія Навасёлкі. У раёне 17 калгасаў, 6 саўгасаў, дзяржплемстанцыя (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Гарбузы)*, імя М. Горкага *(Баравое)*, імя Дзяржынскага *(Дзяржынск)*, «Іскра» *(Чэрнікаўшчына)*, «Камінтэрн» *(Томкавічы)*, «Кастрычніцкая рэвалюцыя» *(Грычына)*, імя Кірава *(Касілавічы)*, імя Леніна *(Станькава)*, «Ленінскі шлях» *(Макаўчыцы)*, «Мір» *(Волма)*, «Непераможны сцяг» *(Забалацце)*, «Перамога» *(Вялікія Навасёлкі)*, «Праўда» *(Баравікі)*, «Расія» *(Зубрэвічы)*, «Чырвоная ворка» *(Старынкі)*, «Чырвоны сцяг» *(Негарэлае)*, імя Фалько *(Чаркасы)*. Саўгасы і іх цэнтры: імя Дакучаева *(Вялікае Сяло)*, «Дзямідавічы» *(Юцкі)*, імя Марата Казея *(Данілавічы)*, «Камсамолец» *(Скірмантава)*, «Путчына» (пас. *Путчына*), імя Фрунзе *(Дворышча)*. Дзяржплемстанцыя «Шыкатавічы» *(Шыкатавічы)*.

На сартавальным пункце ў калгасе імя Дзяржынскага.



Сельская гаспадарка спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве, вырошчванні збожжа і бульбы. Пад с.-г. ўгоддзямі 61% тэр. На 1.1.1971 асушана 7,5 тыс. га зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. га, 1970) 52,0, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 22,6, тэхнічнымі 2,9, бульбаю 7,7, кармавымі 18,6. Са збожжавых пераважаюць жыта, ячмень, пшаніца; з тэхнічных — лён, цукр. буракі. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйной раг. жывёлы 41,6 (у т. л. кароў 20,0), свіней 31,8, авечак і коз 4,9. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка і аўтамаб. дарога Мінск — Брэст. Асн. від транспарту аўтамабільны. На пач. 1971 у раёне было 15 сярэдніх, 13 васьмігадовых, 56 пачатковых, 3 школы рабочай моладзі, 1 завочная, 9 дашкольных устаноў, 57 клубных устаноў, 61 кінаўстаноўка (у т. л. 58 стацыянарных), 42 масавыя бібліятэкі, 6 бальніц, санаторый «Воўчкавічы», 19 фельч.-ак. пунктаў, 3 пункты аховы здароўя, 2 урачэбныя ўчасткі. На 1.1.1971 у раёне працавала 582 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 110 інжынераў, 11 аграномаў, 15 заатэхнікаў, 24 эканамісты, 11 вет. урачоў, 39 урачоў, 325 настаўнікаў і інш.; 1273 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Сцяг Кастрычніка».

С. К. Вайцяховіч. Мінск.

ДЗЯРЖЫЦКІ Мікалай Цітавіч [н. 6(19).12. 1900, в. Баздоўка Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], удзельнік грамадз. вайны. Ген.-м. інж. войск (1954). З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Ваен.-інж. акадэмію (1934). У Чырв. Арміі з лют. 1919. З 1919 удзельнік баёў на Паўд. і Зах. франтах. У Айч. вайну на Паўд., Зах. і 3-м Бел. франтах — нач. інж. войск арміі. У 1944—60 нач. інж. войск ваен. акругі, у цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР. З 1963 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

ДЗЯРКАЧ, птушка сям. пастушковых атр. пастушкоў. Гл. *Драч*.

ДЗЯРКАЧ Анатоль [Дзядок Тарас; сапр. Зімёнка Анатоль Рыгоравіч; 6(18).4.1887, мяст. Турэц Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 5.9.1937], беларускі савецкі паэт-сатырык. Сын фельчара. Скончыў Навагрудскае гарадское вуч. Служыў пісарам у гарадской і земскай управах. За ўдзел у рэвалюц. руху праследаваўся царскімі ўладамі. Пасля Кастр. рэв. працаваў у рэдакцыі газ. «Беларуская вёска», рэдактарам сатыр.-гумарыст. час. «Дубінка». Друкавацца пачаў у 1904 на рус. мове. Выдаў зб. сатыр. вершаў «Пра папоў, пра дзякоў, пра сялян-мужыкоў» (1925), «Усім патроху...» (1930), паэму «Міколава гаспадарка» (1927). Творы Дз., напісаныя проста, у падкрэслена апавядальнай, гутарковай манеры ці ў стылі нар. прыпеўкі, мелі выразную агітацыйную накіраванасць. У вершах для дзяцей апяваў харство роднай прыроды, паэтызаваў працу, дружбу, сав. калектывізм (зб. «Нашы прыяцелі», «Працавітая дзяўчына», «Першы дзень у дзіцячым садзе», 1928; «Звяры нашых лясоў», 1929). Пераклаў на бел. мову паасобныя творы А. Барто, Дз. Беднага, У. Маякоўскага, К. Чукоўскага і інш.

Тв.: Бог удвох, Мн., 1930; Качаргой па абразох, Мн., 1930; Оккупация и интервенция в Белоруссии, М., 1932 (пад сапр. прозвішчам).

І. У. Саламевіч. Мінск.

ДЗЯРНОВА-ПАДЗОЛІСТЫЯ ГЛЕБЫ, глебы леса-лугавой зоны, утвораныя ад дзеяння дзярновага і падзолістага працэсаў на мацярынскую пароду. Пашыраны ў Сярэдняй і Усх. Еўропе, Зах. Сібіры, на Д. Усходзе, у Паўн. Амерыцы. На Беларусі займаюць каля 60% зямельных угоддзяў.

Развіваюцца пад лясамі з травяністым покрывам. У профілі Дз.-п. г. вылучаюць гарызонты: дзярновы (перагнойна-акумулятыўны) — шэры, распадаецца на камякі, у ім назапашваюцца перагной і попельныя элементы; падзолісты (элювіяльны) — светла-шэры або бялявы, бесструктурны або петрывалай ліставатай структуры, бедны на паўтарачныя вокіслы і попельныя элементы, багаты на краменязём; ілювіяльны — ад жоўтага да чырвона-бурага колеру, у ім адкладваюцца паўтарачныя вокіслы; падглеба, або мацярынская парода (укл. гл. ў 3 т., с. 144—145). Дз.-п. г. маюць мала гумусу і пажыўных рэчываў, кіслую рэакцыю, нетрывалую структуру і дрэнную аэрацыю. Паводле ступені развіцця глебаўтваральных працэсаў падзяляюцца на дзярнова-слаба-, сярэдне- і моцнападзолістыя. Каб павысіць урадлівасць Дз.-п. г., паглыбляюць ворны гарызонт, паляпшаюць яго структуру, абагачаюць глебы арган., мінер. і зялёным угнаеннямі, мікраэлементамі, вапнуюць іх.

Літ.: Пономарева В. В. Теория подзолообразовательного процесса, М.—Л., 1964; Почвы БССР, Мн., 1952; Гаркуша И. Ф. Эволюция дерново-подзолистых почв под влиянием окультуривания, «Доклады АН БССР», 1965, т. 9, № 10.

ДЗЯРНОВАЯ РУДА, рыхлая, зрэдку сцементаваная порыстая парода, складзеная пераважна з *ліманіту* з прымессю пяску і гліны. Утвараецца з удзелам мікраарганізмаў у багне і на вільготных лугах. Гл. *Балотныя руды.*

ДЗЯРУГА Аляксандр Апісімавіч [н. 10(23).8.1901, Мінск], беларускі савецкі музычны дзеяч. Засл. дз. культ. БССР (1961). Скончыў бел. настаўніцкія курсы ў Вільні (1922). Вядомы як арганізатар самадзейных аркестраў нар. інструментаў. У 1948 заснаваў у Смаргоні аркестр цымбалістаў (у 1964 аркестру прысвоена званне народнага), яго пазменны дырыжор. Аўтар шэрагу песень і танцаў, якія выконваюцца самадзейнымі калектывамі.

ДЗЯРУГА Васіль Карпавіч (1905, в. Дубаўручча Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 5.2.1959), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. У 1930—41 на сав. і парт. рабоце. У партызанах з крас. 1942 — камандзір атрада; з сак. 1944 камандзір *партызанскай брыгады імя М. А. Шчорса* Мінскай вобл. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

ДЗЯРЭЧЫН, вёска ў Зэльвенскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Сіпа. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Чарняхоўскага. За 13 *км* на ПнУ ад Зэльвы, 98 *км* ад Гродна, 15 *км* ад чыг. ст. Зэльва; аўтобусная ст. на шашы Гродна — Слонім і на шашы, якая злучае вёску з Зэльвай. 991 ж., гасп. 334 (1971). Лесазавод, млын, пякарня, каўбасны цэх, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, вет. пункт, адда. сувязі, сталовая, 5 магазінаў. У чэрв. 1942 нямец.-фаш. захопнікі загубілі ў Дз. 6479 сав. грамадзян. Помнік 54 аднавяскоўцам і 80 сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну. У 1786 у Дз. арх. Я. Бекерам пабудаваны палац у стылі раняга класіцызму (разбураны ў Вял. Айч. вайну).

ДЗЯРЭЧЫНА, вёска ў Блеўчыцкім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл., на р. Морач. Цэнтр калгаса «Праўда». За 22 *км* на Пд ад Капыля, 139 *км* ад Мінска, 12 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы, каля шашы Слуцк — Іванцэвічы (3 *км*). 365 ж., гасп. 121 (1971). Лесапільня, млын. Пач. школа, магазін.

ДЗЯСНА, рака ў РСФСР і УССР, левы прыток Дняпра. Даўж. 1130 *км*, пл. бас. 88,9 тыс. *км*². Пачынаецца на Смаленскім узв., упадае ў Дняпро каля Кіева.

У верхнім цячэнні берагі пераважна нізінныя і балоцістыя, шыр. даліны 200—500 *м*, шыр. рэчышча ад 20 да 130 *м*. Ніжэй г. Бранска правы бераг высокі, парэзаны ярамі, шыр. даліны 4—6 *км*, рэчышча нястойлівае; у пойме азёры, старыя рэчышчы. Гал. прытокі: левыя — Балва, Наўля, Няруса, Сейм, Асцёр; правыя — Судасць, Сноў. Жыўленне снегавое і дажджавое. Ледастаў з 1-й дэкады снеж. да пач. красавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 350 *м*³/*сек*. Суднаходная на 535 *км*, ад вусця да г. Ноўгарад-Северскі; лесасплаўная. Гал. прыстані: Ноўгарад-Северскі, Макошына, Чарнігаў, Асцёр, Жукін.

ДЗЯСНІНСКАЯ КУЛЬТУРА, 1) культура мезалітычных плямёнаў (8—5-е тысячагоддзі да н. э.), якія жылі ў бас. Дзясны і на У Пасожжа. Дз. к. характэрны макралітычны інвентар — вялікія грубаапрацаваныя сякеры, скрэблы, бакавыя і клінападобныя разцы, канцавыя скрабкі, вастрыі і інш. 2) Культура неалітычных плямёнаў 2-й пал. 4—3-га тысячагоддзяў да н. э. на той жа тэрыторыі. У арнаменце керамікі пераважаюць круглыя, авальныя і ромбападобныя ямкі. Прылады працы і інвентар блізкія да мезалітычных.

Літ.: Левенок В. П. Мезолит среднерусского днепровско-донского междуречья и его роль в сложении местной неолитической культуры, М.—Л., 1966 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 126).

ДЗЯТЛАВА, гар. пасёлак (з 1940), цэнтр Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. За 148 *км* на ПдУ ад Гродна, 13 *км* ад чыг. ст. Наваельня. Аўтобусная станцыя на лініі Ліда — Слонім. 4,5 тыс. ж. (1971).

Упершыню ўпамінаецца ў 1498 як уладанне кн. Астрожскіх. З канца 18 ст. мястэчка Слонім-

Дзятлава. Плошча імя 17 верасня.



скага пав. Гродзенскай губ. У Дз. выраблялі паркет, які наз. «дзятлаўскім». У 1897 у Дз. 3,2 тыс. ж. 3 чэрв. 1941 да 8.7.1944 акупаваны нямец.-фаш. захопнікамі.

Прамысл. прадпрыемствы: маслазавод, вінзавод, хлеба-, прамкамбінат, к-т быт. абслугоўвання, адда. Сельгастэхнікі, 2 сярэднія школы, школа-інтэрнат, школа рабочай і сельскай моладзі, муз. і спарт. школы, дзіцячыя сад і яслі, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, 2 масавыя б-кі, бальніца. Абеліск Славы, магіла Невядомага салдата. Магілы Героя Сав. Саюза П. Г. *Пятрова* і Я. Я. *Фогеля*. Брацкая магіла 64 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні Дз. і раёна. *Дзятлаўскі музей народнай славы.*

ДЗЯТЛАВІЧЫ, вёска ў Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл. Падпарадкоўваецца Роскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 27 *км* на Пн ад Ваўкавыска, 73 *км* ад Гродна, 12 *км* ад чыг. ст. Рось. 197 ж., гасп. 64 (1971). Васьмігадовая школа, фельч.-ак. пункт, магазін.

ДЗЯТЛАВІЧЫ, вёска ў Лунінецкім р-не Брэсцкай вобл., на правым беразе р. Цна; чыг. ст. на лініі Лунінец — Баранавічы. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. За 13 *км* на Пн ад Лунінца, 253 *км* ад Брэста, каля шашы Лунінец — Баранавічы (1 *км*). 2882 ж., гасп. 607 (1971). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя, васьмігадовая і 2 пач. школы. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 3 магазіны. Помнік 102 сав. воінам і партызанам, помнік 19 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДЗЯТЛАЎКА, рака, левы прыток Моўчадзі (бас. Нёмана). Даўж. 25 *км*. Цячэ ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл. Вадазбор (151 *км*²) у межах Навагрудскага ўзв. Рэльеф сярэдне- і буйнаўзгорысты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 1 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі. На рацэ г. п. Дзятлава.


ДЗЯТЛАЎСКІ МУЗЕЙ НАРОДНАЙ СЛАВЫ, засн. ў 1966 у г. п. Дзятлава Гродзенскай вобл. Адкрыты 5.5.1968. У 9 экспазіцыйных залах (пл. 364 *м*²) і фондах музея каля 4 тыс. экспанатаў (1970). Экспазіцыя музея адлюстроўвае гісторыю раёна ад Кастр. рэвалюцыі да нашых дзён. Дакумент. матэрыялы, фотаздымкі, рэчавыя экспанаты знаёмяць з актыўнымі барацьбітамі за Сав. ўладу на тэр. раёна ў гады грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі (Ф. С. Бабрукевічам, П. Р. Гранкоўскім, П. М. Чучэйкам, І. П. Чырвоным), расказваюць пра баявыя будні партыз. брыгады імя Леніна, якая ў 1942—44 змагалася на тэр. раёна, яе кіраўнікоў (Герояў Сав. Саюза Б. А. *Булата* і Ф. М. *Сінічкіна*, Р. В. Макарава, М. М. Пацалуева, Г. А. Шубіна) і дзейнасць падпольных райкомаў партыі і камсамола, пра сав. воінаў і партызанаў, якія вызвалялі раён ад ням.-фаш. захопнікаў (Героя Сав. Саюза П. Г. *Пятрова* і Я. Я. *Фогеля*, В. А. Канавалава, І. Ю. Філідовіча). У экспазіцыі матэрыялы пра дасягненні працоўных раёна ў развіцці нар. гасп. і культуры. У 1970 музей наведала 15 тыс. чал.

ДЗЯТЛАЎСКІ РАЁН, у складзе Гродзенскай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на ПдУ вобл. Плошча 1,5 тыс. *км*². Нас. 55,1 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 17 сельсаветаў; 3 гар. пасёлкі: Дзятлава — цэнтр раёна, Казлоўшчына, Наваельня.

Паўн. і зах. часткі раёна займае Нёманская нізіна, складзеная з водналедавіковых, азёрных і рачных адкладаў, пярэдка з масівамі тарфянікаў. На У раёна — узгорыстамарэннае Навагрудскае ўзвышша выш. да 282 *м*, у межах раёна значна парэзанае. Карысныя выкапні: 9 радовішчаў мелу з агульнымі запасамі 65,9 млн. *т* (у т. л. радовішчы Курпешы — 22,6 млн. *т*, Вензавец — 16,2 млн. *т* і Раклевічы — 8,1 млн. *т*); 2 радовішчы цементных глін — 6,7 млн. *т* (у т. л. радовішча Зачэпічы — 3,8 млн. *т*); 4 радовішчы цагельнай сыравіны — 0,9 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Курпешы — 0,5 млн. *м*³); радовішча глін для аглапарыту Даліна — 4,2 млн. *м*³; 2 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу — 3 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Дварэцкае — 2,8 млн. *м*³), 2 радовішчы буд. пяскоў — 0,5 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Алёхнавічы — 0,3 млн. *м*³). Сярэдняя т-ра студз. ад —5,5 да —6, ліп. 17,5—18 °С. Ападкаў 647 *мм* за год. Вегет. перыяд 196 дзён. Гал. рэкі: Нёман і прытокі Моўчадзь з Ятранкай і Шчара з Пад'яваркай. Пад лесам каля 42% тэр., пераважаюць хваёвыя, расце елка; з лісцевых бяроза, вольха і асіна. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (65,5%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (10,2%), дзярнова-балотныя (13,4%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя (10,9%). З мінер. глебаў 78,6% супясчаных, 19,6 пясчаных, 1,8% суглінкавых. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 40 (цана бала 0,25 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 24, усіх с.-г. угоддзяў — 35. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, палякі і інш. Сярэдняя шчыльн. 36,7 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 18%. Прамысл. прадпрыемствы: Дварэцкі льнозавод; хлебакамбінат, маслазавод, вінзавод, прамкамбінат, камбінат быт. абслугоўвання ў Дзятлаве, Боркаўскі крухмальны і Наваельненскі камбікормавы з-ды, Парэцкі спіртзавод. 19 калгасаў і 5 саўгасаў (1971).

Рака Моўчадзь каля вёскі Дварэц Дзятлаўскага раёна.





Калгасы і іх цэнтры: «Ахонава» *(Ахонава)*, «Барацьбіт» *(Прудок)*, «Беларусь» *(Таркачы)*, «Гвардыя» *(Лапушна)*, імя XXII з'езду КПСС *(Старадзельня)*, «Дружба» *(Дзям'янаўцы)*, «Запаветы Леніна» *(Войневічы)*, «Зара» *(Апаліна-Басіна)*, імя Заслонава *(Дварэц)*, «Іскра» *(Лявонавічы)*, імя Кірава *(Нагародавічы)*, «Новае жыццё» *(Сачаўляны)*, «Перамога» *(Руда Яварская)*, «1 Мая» *(Жукоўшчына)*, «Расія» *(Раклевічы)*, «Слава працы» *(Дзянісава)*, імя Чапаева *(Змяёўцы)*, імя Чкалава *(Азяраны)*, «Чырвоны Кастрычнік» *(Вензавец)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Горка» *(Горка)*, «Мяляхавічы» *(Белагурка)*, «Навагрудскі» *(Данілавічы)*, «Параўча» *(Хейлевічы)*, «Работна» *(Работна)*.

С. гасп. спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі ў спалучэнні з ільнаводствам. Пад с.-г. ўгоддзямі 47% тэр. раёна. На пач. 1971 асушана 6,4 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 45,8, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 19,8, бульбай 7,3, тэхнічнымі 2,2, кармавымі культурамі 16,2. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 46,9 (у т. л. кароў 22,3), свіней 28,3, авечак і коз 7,3. Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Ліда — Баранавічы, аўтамабільныя дарогі Ліда — Дзятлава — Казлоўшчына — Слонім, Дзятлава — Навагрудак і інш.

У 1971 у раёне было 16 сярэдніх, 22 васьмігадовыя, 70 нач. школ, 3 школы рабочай і сельскай моладзі, 8 дашкольных устаноў, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. ў г. п. Казлоўшчына, 40 клубных устаноў, 54 б-кі, 53 кінаўстаноўкі, у т. л. 33 стацыянарныя; 7 бальніц, 25 фельч.-ак. пунктаў, 9 паліклінік і амбулаторый, дыспансер, лёгачна-туберкулёзны санаторый «Навагрудскі», дзіцячы агульнасаматычны санаторый «Ластаўка». У раёне працуе 642 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 38 інжынераў, 35 аграномаў, 32 эканамісты, 40 заатэхнікаў, 13 вет. урачоў, 358 настаўнікаў, 50 урачоў; 1341 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газета «Перамога».

А. В. Духаніна. Мінск.



Праверка насення на ўсходжасць у Дзятлаўскай раённай насеннай інспекцыі.

ДЗЯТЛЫ (Piciformes), атрад птушак. Уключае каля 360 відаў. Падзяляецца на 2 падатр.: уласна Дз. (Pici) і якамары (Galbulae). Уласна Дз. складаюцца з 4 сям. Прадстаўнікі адпаго з іх (Picidae, 224 віды, пашыраны на ўсім свеце, апрача Аўстраліі, Палінезіі і Мадагаскара) жывуць на тэр. СССР. На Беларусі 9 відаў: *чорны дзяцел, зялёны дзяцел, сіві дзяцел, трохпальцы дзяцел, круцігалоўка* і 4 віды роду *стракатых дзятлоў*.

Літ.: Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

ДЗЯЧКОЎ Аляксей Фёдаравіч (н. 9.3.1918, в. Малыя Алабухі 1-я Барысаглебскага пав. Тамбоўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1941. Вызначыўся ў кастр. 1943 у Гомельскай вобл. Група разведчыкаў на чале з Дз. і штурмавы атрад фарсіравалі Дняпро каля Лоева, захапілі мінамётную батарэю, павярнулі яе супраць ворага. Жыве ў Кіеве.

ДЗЯЧКОЎ Міхаіл Іванавіч [4(17).11.1905, с. Князеўка Саратаўскага пав.— 12.6.1963], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Ін-т сав. буд-ва ў Саратаве (1936), Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1951). У 1936—41 на сав. рабоце ў Віцебскай і Баранавіцкай абл. У партызанах з ліп. 1941 — камандзір атрада, з мая 1942 камандзір *партызанскай брыгады 2-й Беларускай* імя П. К. Панамарэнкі (2-га складу) Віцебскай вобл., з жн. 1943 камандзір і камісар *партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі*. У 1944—52 на сав. рабоце ў Гродзенскай, Пінскай, Віцебскай абл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Айч. Вайны 1-й ступені, медалямі.

«ДИФФЕРЕНЦИАЛЬНЫЕ УРАВНЕНИЯ», усесаюзны штомесячны навуковы часопіс, які выдае АН БССР. Выходзіць з 1965 у Мінску на рус. мове. Асн. навук. кірункі — звычайныя дыферэнцыяльныя ўраўненні, ураўненні ў прыватных вытворных, інтэгра-дыферэнцыяльныя і інтэгральныя ўраўненні і ўраўненні ў канечных рознасцях. У складзе рэдкалегіі вядомыя вучоныя-матэматыкі СССР. Гал. рэдактар акад. АН БССР М. П. Яругін (з 1965).

ДЛУГАШ (Długosz) Ян (1415, г. Бжазніца — 19.5.1480), польскі гісторык і дыпламат: кракаўскі канонік (з 1436), архіепіскап львоўскі (1480). Асн. твор Д. «Гісторыя Польшчы» (12 кніг на лац. мове), дзе апісаў падзеі з даўніх часоў да 1480 (дае звесткі пра Беларусь). Вяршыня польскай сярэдневяковай гістарыяграфіі, першая ў Польшчы навук. гістар. праца, напісаная на аснове крыніц (хронік, летапісаў) успамінаў жывых сведак падзей. Значны літ. помнік свайго часу.

Тв.: Рус. пер.— Грюнвальдская битва, М.—Л., 1962.

ДЛУГАШЭЎСКІ Канстанцін Навумавіч [н. 11(24).12.1905, в. Слабада-Кучанка Слуцкага пав. Мінскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1928. У 1925—41 на парт., сав. і гасп. рабоце. У Айч. вайну на Зах., Сталінградскім, 3-м Прыбалтыйскім франтах. З 1945 першы нам. старшыні Прэзідыума Вярх. Савета БССР, з 1946 старшыня Мінскага гарвыканкома, з 1954 нам. міністра, у 1957—68 нач. Гал. ўпраўлення камунальнай гасп. БССР. На XIX—XXI з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—4-га, Вярх. Савета БССР 1, 3, 5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

ДЛУСКІ (больш правільна Длускі-Лангер; Dłuski-Langer) Астап [31.10.1892, Бучач, Аўстра-Венгрыя (са снежня 1939 Цярнопальская вобл. УССР) — 12.2.1964], польскі паліт. і грамадскі дзеяч. З сям'і настаўніка. З юнацкіх гадоў удзельнічаў у польскім с.-д. руху. З 1918 камуніст. Рэдагаваў парт. выданні. Неаднойчы быў зняволены. Дэлегат Камуніст. партыі Польшчы на 6-м і 7-м канграсах Камінтэрна. У 2-ю сусв. вайну жыў у Францыі, удзельнічаў у франц. Руху Супраціўлення. У 1945 вярнуўся на радзіму, выбраны чл. ЦК Польскай рабочай партыі, з 1948 чл. ЦК ПАРП. Актыўны дзеяч польскага і міжнар. руху прыхільнікаў міру. З 1950 чл. Сусв. Савета Міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1960.



ДЛУСКІ Баляслаў Францавіч (19.8.1826, Віленскі пав.— 10.5.1905), удзельнік паўстання 1863 у Літве і на Беларусі. Вучыўся ў Маскоўскім ун-це (1857—61). Дэмакрат, прыхільнік «чырвоных», з 1862 чл. *Літоўскага правінцыяльнага камітэта*, паплечнік К. Каліноўскага па падрыхтоўцы паўстання, ваен. начальнік Ковенскага ваяводства, арганізатар паўстанцкіх атрадаў (псеўд. Ябланоўскі). 10.6. 1863 каля мяст. Папяляны Шавельскага пав. разбіў вялікі карны атрад. З кастр. 1863 ваен. камісар Літвы і Беларусі за мяжой, да апошніх дзён паўстання трымаў сувязь з К. Каліноўскім. З 1873 у Галіцыі, працаваў доктарам, мастаком. Аўтар успамінаў пра паўстанне.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.


ДМАХОЎСКІ Вікенцій [1807, в. Самішчы Ашмянскага пав. Віленскай губ.— 10 (22).2. 1862], мастак-пейзажыст, тэатр. дэкаратар і ілюстратар. Творчасць звязана з маст. культурай Беларусі, Літвы і Польшчы. Вучыўся ў Віленскім ун-це на літ. ф-це (1826—29), адначасова займаўся жывапісам у Я. Рустэма. Удзельнік паўстання 1830—31. У 1831—33 у эміграцыі, працаваў ва Усх. Прусіі. У 1833 вярнуўся ў Вільню, пісаў дэкарацыі ў гарадскім т-ры. У 1855—58 жыў у в. Брыцянка каля Навагрудка. Аўтар рамант. пейзажаў «Веркі» (1840), «Радзіма» («Двор у Нагародавічах», 1843), «Возера Свіцязь», «Дом А. Міцкевіча ў Навагрудку», «Каля пераправы», «Пажар у лесе» і інш.; іл. да «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча.

Л. І. Дробай. Мінск.



В. Дмахоўскі. Радзіма. 1843. Маст. музей Літоўскай ССР. Вільнюс.

ДМАХОЎСКІ (псеўд. Генры Д. Сандэрс) Генрык Міхайлавіч [14(26).10.1810, маёнтак Забалоцце Браслаўскага пав. Віленскай губ.— 14(26).5.1863], удзельнік рэвалюц. руху на Беларусі ў 30—60-я г. 19 ст., скульптар. З дваран. Скончыў Віленскі ун-т (1828). Удзельнік паўстання 1830—31 (у атрадзе В. Пяткевіча). Пасля разгрому паўстання эміграваў у Францыю (1832—33), там з рэвалюц. эмігрантаў рыхтаваў новае паўстанне (т.



зв. экспедыцыя Заліўскага). Пазней за рэвалюц. дзейнасць у Галіцыі засуджаны (1834—41) аўстр. ўладамі. У 1841—51 вучыўся скульптуры і працаваў у Парыжы [стварыў помнікі: В. Пяткевічу ў Парыжы (1848) і героям паўстання 1831 у Познані (1849)]; з 1851 да 1861 у ЗША (бюсты Т. Касцюшкі і Т. Джэферсана для Кангрэсу ў Вашынгтоне; помнік К. Пуласкаму ў Саване, помнік жонцы ў Філадэльфіі і інш.). Інш. работы: бюст Т. Дзялінскага (Познань), скульптурная група «Гарыбальдзі з воінамі», медаль «Апафеоз Т. Касцюшкі» і інш. З кастр. 1861 на радзіме (стварыў у Вільні бюст У. Сыракомлі і помнік Б. Радзівіл). Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1863. Паўстанцкі камісар Дзісенскага пав., нач. атрада. Загінуў у баі ў в. Парэчча Барысаўскага пав. Мінскай губ.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс; *Л. Н. Дробаў.* Мінск.


ДМАХОЎСКІ Уладзіслаў (1841, Вільня — г. см. невяд.), жывапісец-жанрыст і графік. Сын пейзажыста В. *Дмахоўскага.* Творчасць звязана з маст. культурай Польшчы. З 1872 вучыўся ў Варшаве. З 1875 выкладаў маляванне ў гімназіях (Чанстахоў). У 1868—88 жыў на Гродзеншчыне, у Кракаве і Варшаве, удзельнічаў у выстаўках. Сярод твораў: анімалістычныя малюнкі; жывапісныя палотны і акварэлі («Рамізнік», «Сані», «Паштовая станцыя» і інш.), у якіх адлюстравана жыццё дробнамаянтковай бел. і польск. шляхты.

ДМАХОЎСКІ Фадзей Уладзіслававіч (1858, каля Пінска — г. см. невяд.), жывапісец і графік. Творчасць звязана з маст. культурай Беларусі, Расіі і Польшчы. Сын удзельніка паўстання 1863, сасланага ў Сібір. Выхоўваўся ў сваякоў у Дзвінску. У 1873—77 вольны слухач Пецярбургскай АМ, потым вучыўся ў Кракаве ў Я. Матэйкі. У 1907 выкладаў арнаментыку ў Вышэйшай школе заахвочвання мастацтваў у Пецярбурзе. Пісаў гістар. кампазіцыі і пейзажы. Аўтар серыі малюнкаў гербаў бел. гарадоў для «Гербоўніка Літоўскага», які публікаваўся ў пач. 20 ст. ў віленскіх часопісах «Kwartalnik Litewski» («Квартальнік Літоўскі») і «Litwa i Ruś» («Літва і Русь»). Вядома яго графічная серыя партрэтаў польск. каралёў (Леха, Крака, Мешка II, Пяста і інш.), гістар. асоб (Т. Касцюшкі, Напалеона) і дзеячаў культуры (А. Міцкевіча і інш.).

Л. Н. Дробаў. Мінск.

ДНЕПРА-ДАНЕЦКАЯ КУЛЬТУРА, гл. *Грабеньчата-накольчатай керамікі культура.*

ДНЕПРА-ДЗВІНСКАЯ КУЛЬТУРА, культура балцкіх плямёнаў 8 ст. да н. э.— 4 ст. н. э., якія жылі ў Верхнім Падняпроўі, Верхнім і Сярэднім Падзвінні, у вярхоўях Акі і на левабярэжных прытоках р. Вялікай. Даследавалася А. М. Ляўданскім, А. Р. Мітрафанавым, К. П. Шутам, Л. В. Аляксеевым. Плямёны Д.-дз. к. жылі на ўмацаваных гарадзішчах, якія храналагічна падзяляюцца на ранніе і познія. Насельніцтва ранніх гарадзішчаў будавала доўгія жытлы слупавой канструкцыі, якія мелі некалькі памяшканняў з адкрытымі агнішчамі, ужывала касцяныя прылады працы і ўпрыгожанні — коп'і, стрэлы, шылы, вастрыі, шпількі і інш. На позніх гарадзішчах жыхары будавалі невялікія хаты зрубнай і слупавой канструкцый, ужывалі жалезныя і бронзавыя прылады працы і ўпрыгожанні — сякеры, сярпы, нажы, шпількі, грыўны шыйныя, падвескі, пярсцёнкі і інш. Кераміка гладкасценная, слабапрафіляваная і слоікападобнай формы. Асн. занятак пасельніцтва — земляробства, жывёлагадоўля, паляванне і рыбалоўства. Найб. важныя помнікі Д.-дз. к. на тэр. Беларусі: Паддубнікі, *Язна* (Міёрскі р-н), *Урагава, Абрамава, Асвейскія гарадзішчы* (Верхнядзвінскі р-н), *Буракова, Казінова, Загорцы* (Гарадоцкі р-н), *Гаравыя* (Полацкі р-н), *Кублічы* (Ушацкі р-н) і інш.



Кераміка днепра-дзвінскай культуры (в. Язна Міёрскага р-на). Дзяржм. музей БССР.

Літ.: Шут К. П. Памятники раннего железного века на севере Белоруссии, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1966; Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья, М., 1970; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970.

А. Р. Мітрафанаў. Мінск.

ДНЕПРАДЗЯРЖЫНСК (да 1936 Каменскае), горад абл. падпарадкавання ў Дняпрапятроўскай вобл. УССР. Засн. ў 1750. Рачны порт на Дняпры, чыг. станцыя. 227 тыс. ж. (1970). Перайменаваны на ўшанаванне памяці Ф. Э. Дзяржынскага. Прамысловасць металургічная, хім., маш-буд., коксахімічная, буд. матэрыялаў. Металург. з-д імя Дзяржынскага, хім. камбінат, 2 коксахімічныя, вагонабуд., кацельна-дапаможнага абсталявання, кацельна-механічны, кацельна-зварачны, чыгуналіцейны, цэментны з-ды, з-д зборнага жалезабетону, швейная ф-ка. Прадпрыемствы харч. і мясцовай прамысловасці. ГЭС, ДРЭС. Індустрыяльны ін-т, 9 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Музей.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК (да 1926 Екацярынаслаў), горад, цэнтр Днепрапятроўскай вобл. УССР. Размешчаны ўздоўж Дняпра. Рачны порт, чыг. вузел, аэрапорт. 863 тыс. ж. (1970). Перайменаваны на ўшанаванне памяці Р. І. Пятроўскага. Прамысловасць металургічная, маш.-буд., металаапр., хім., буд. матэрыялаў. Каля 150 прамысл. прадпрыемстваў. Найбольшыя з-ды: металургічны, 2 трубапракатныя, металург. абсталявання, электравозабуд., вагонарамонтны, металаканструкцый, прэсаў, коксахімічны, электрамеханічны, радыёзавод, сілікатны, шынны, з-д «Пластмас», лесазавод, мэблевы камбінат, абутковае і швейнае аб'яднанні, папяровая ф-ка. Прадпр. харчовай, лёгкай і мясцовай прамысл. 8 ВНУ (у т. л. *Днепрапятроўскі універсітэт*), 29 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 3 тэатры (рус. драм., укр. драм., лялечны), філармонія, гістар. і мастацкі музеі.


Засн. Д. у 1783. Развіццю прамысловасці спрыяла буд-ва ў 1884 чыг. Данбас — Крывы Рог. Сав. ўлада ўстаноўлена 29.12.1917(11.1.1918). У Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (25.8.1941—25.10.1943), разбураны. Пасля вайны адноўлены.

Літ.: Дніпропетровськ сьогодні, Дніпропетровськ, 1962.

ДНЕПРАПЯТРОЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе УССР. Утворана 27.2.1932. Пл. 31,9 тыс. км². Нас. 3344 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 20 раёнаў; 20 гарадоў, 56 гар. пас. Цэнтр г. Днепрапятроўск.

Паверхня вобласці — хвалістая раўніна. У цэнтр. ч. Прыдняпроўскае ўзв. выш. да 172 *м*, якое на ПдЗ паступова пераходзіць у Прычарнаморскую нізіну, на ПнЗ заходзіць Прыдняпроўская нізіна, на ПдУ адгор'і Прыазоўскага ўзвышша. Карысныя выкапні: жал. руда, жалезістыя кварцыты, марганец, тытан, баксіты, сланцы, каалін, вогнетрывалыя гліны, граніты, кам. і буры вугаль, прыродны газ. Клімат умерана-кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —5; —6,1, ліп. 21,8—22,6 °С. Ападкаў на Пд 400 *мм*, на Пн 490 *мм* за год. Вегет. перыяд каля 210 дзён. Гал. рака Дняпро (270 км у межах вобл.) з прытокамі Арэль, Самара, Мокрая Сура, Базаўлук, Інгулец. Днепрадзяржынскае і Кахоўскае вадасх. Глебы звычайныя і паўд. чарназёмы, у далінах рэк чарназёмна-лугавыя, дзярнова-лугавыя, месцамі саланцы. Д. в. размешчана ў стэпавай зоне. Стэп распараны. Асн. насельніцтва ўкраінцы. Жывуць рускія. Сярэдняя шчыльн. 105 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 76% (1970). Найбольшыя гарады: Днепрапятроўск, Крывы Рог, Днепрадзяржынск, Нікапаль.

Аб'ём валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці ў 1970 павялічыўся ў параўнанні з 1940 у 8,8 раза. Асн. галіны: жалезарудная, марганцаварудная, металургічная. Развіта маш.-буд., хім., харч. прамысловасць, вытворчасць буд. матэрыялаў. Жалезарудная прамысловасць у Крыварожскім бас. У 1970 здабыта 103,8 млн. *т* жал. руды. Здабыча марганцавых руд у Нікапальскім марганцавым бас. Хутка развіваецца вугальная прамысловасць. Металург. з-ды ў Крывым Розе, Днепрапятроўску, Днепрадзяржынску, Новамаскоўску, трубапракатныя ў Днепрапятроўску, Нікапалі. Машынабудаванне ў Днепрапятроўску (з-д цяжкіх прэсаў, металаканструкцый, металург. абсталявання, камбайнавы і інш.). У Крывым Розе з-д горнашахтавага абсталявання, у Днепрадзяржынску вагонабуд. з-д. Коксахімічныя з-ды ў Днепрадзяржынску і Днепрапятроўску, азотнатукавы з-д у Днепрадзяржынску, шынны з-д, прадпрыемствы лакафарбавай прамысловасці і вырабаў з пластмасы ў Днепрапятроўску. Вытворчасць буд. і вогнетрывалых матэрыялаў (у Днепрапятроўску, Днепрадзяржынску, Крывым Розе, Нікапалі, Паўлаградзе). У Днепрапятроўску адна з найбольшых у УССР папяровая ф-ка. Энергетычная база прамысловасці — Прыдняпроўская, Крыварожская і Днепрадзяржынская ДРЭС, Днепрадзяржынская ГЭС. Выкарыстоўваецца коксавы, а таксама прыродны газ Шабялінскага радовішча. У харч. прамысловасці найб. развіты мукамольная, макаронная, мясная, малочная, піваварная галіны. Асн. прадпрыемствы ў Днепрапятроўску і Днепрадзяржынску. Лёгкая прамысловасць у найб. буйных гарадах. У с. гасп. пераважае вырошчванне збожжа, сланечніку; жывёлагадоўля мяса-малочнага кірунку. У 1971 у Д. в. 328 калгасаў і 99 саўгасаў. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 2048, з іх пад збожжавымі 1066,2,



тэхн. 281,7, бульбай і агародніна-бахчавымі 108, кармавымі 592,1. Асн. збожжавыя культуры азімая пшаніца (288,4 тыс. *га*) і кукуруза (375,7 тыс. *га*). З тэхн. слапечнік (228, 7 тыс. *га*). Садоўніцтва. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 1210,9 (у т. л. кароў 470,7), свіней 1104,7, авечак і коз 464,3. Даўж. чыгунак 1550 *км* (1970). Асн. чыг. вузлы Днепрапятроўск, Ніжнедняпроўск, Сінельнікава і інш. Аўтамаб. дарог 8,9 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 3,3 тыс. *км*. 13 ВНУ (у т. л. ун-т), 67 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 5 тэатраў, 5 музеяў. Абл. газеты «Днепровская правда» і «Зоря».

Літ.: Історія міст і сіл Української РСР. Дніпропетровська область, Київ, 1969. *В. П. Варанцова.* Мінск.

ДНЕПРАПЯТРОЎСКІ УНІВЕРСІТЭТ імя 300-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй, вышэйшая навуч. ўстанова ў Днепрапятроўску. Засн. ў 1918 на базе Вышэйшых жаночых курсаў. У ун-це працавалі вядомыя сав. вучоныя Л. У. Пісаржэўскі, Г. В. Курдзюмаў і інш. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: гісторыка-філал., механіка-матэм., фіз., фізіка-тэхн., хім., біялагічны. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае; ёсць аспірантура. Пры ун-це НДІ геалогіі, гідрабіялогіі, б-ка, бат. сад, гістар. і заалагічны музеі. Прымае да абароны кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Ун-т выдае «Наукові записки» (з 1937).

ДНЕПРА-ЭЛЬБСКАЯ КУЛЬТУРА, культура неалітычных плямёнаў, якія ў 3-м тысячагоддзі да н. э. жылі на тэр. Польшчы ад Одры да Зах. Буга. Вылучана польск. вучоным А. Гардаўскім з сукупнасці помнікаў культуры грабеньчата-ямачнай керамікі. У апошні час наз. польска-ўкраінскай. Д.-э. к. характэрны вастрадонны посуд, упругожаны наколамі, барознамі, прадаўгаватымі і грабеньчатымі адбіткамі, крамяпёвыя прылады працы і інш. На ПнУ і У Д.-э. к. пераходзіла ў *нёманскую культуру* і *грабеньчата-накольчатай керамікі культуру*.

Літ.: Gardawski A. Zagadnienie kultury «ceramiki grzebykowej» w Polsce, «Wiadomości archeologiczne», Warszawa, 1958, t. 25, zesz. 4.

ДНЕПРЫК, рака, левы прыток р. Ведрыч (бас. Дняпра). Даўж. 26 *км*. Цячэ ў Рэчыцкім р-не Гомельскай вобл. Вадазбор (118 *км*²) плоска-хвалісты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,45 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ДНЕСТР (стараж.-грэч. Тýras), рака на З УССР і ў Малд. ССР. Даўж. 1350 *км*. Пл. бас. 72,1 тыс. *км*². Пачынаецца на паўн. схілах Карпат на выш. каля 900 *м*. Упадае ў Днястроўскі ліман Чорнага м.

У верхняй ч. (да г. Самбара) рака цячэ ў вузкай даліне са стромкімі скалістымі берагамі. На перадгорнай раўніне больш спакойная, шмат прытокаў. У межах Падольскага плато даліна авілістая, каньёнападобная. Ніжэй Камяніца-Падольскага ў рэчышчы Д. выходзяць на паверхню крышталічныя пароды, якія калл г. Ямпаля ўтвараюць парогі. Ад г. Рыбніца цячэ па Прычарнаморскай нізіне ў шырокай даліне (8—16 км), утвараючы вял. пойму са шматлікімі пратокамі і азёрамі. Жыўленне дажджавое і снегавое. Ледастаў (са снежня да сакавіка) нястойлівы. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 339 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца для арашэння і як крыніца гідраэнергіі (Дубасарская ГЭС магутн. 48 тыс. *квт*). Суднаходны ад г. Галіч. Найбольшыя гарады і прыстані: Магілёў-Падольскі, Сарокі, Дубасары, Бендэры, Цірасполь.


ДНЯПРО́, Днепр (старажытна грэчаскае Барысфен), рака ў Еўрап. частцы СССР. Трэцяя па пл. бас. і даўжыні ў Еўропе (пасля Волгі і Дуная). Даўж. 2201 *км* (у межах БССР 697 *км*, цячэ ў Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях). Уся пл. бас. 504 тыс. *км*² (на тэр. БССР 104 тыс. *км*²). Верхняя частка размешчана ў зоне мяшаных лясоў, сярэдняя ў лесастэпавай зоне, ніжняя ў стэпавай. Пачынаецца на Валдайскім узв., упадае ў Дняпроўскі ліман Чорнага м.


Засяленне бас. Д. чалавекам пачалося ў эпоху *палеаліту*. У 4—3-м тысячагоддзях да н. э. ў лесастэпавым Падняпроўі жылі плямёны *трыпольскай культуры*, у 2-м тысячагоддзі да н. э.— *шнуравой керамікі культуры*. У жалезным веку Сярэдняе і Верхняе Падняпроўе насялялі плямёны *мілаградскай культуры*, потым *зарубінецкай культуры*. Стэпавыя раёны Паўн. Прычарнамор'я займалі скіфы, пазней — *сарматы*. Непадалёку ад вусця Д. ў 6 ст. да н. э.— 4 ст. н. э. існавала стараж.-грэч. горад-дзяржава Ольвія. У працах стараж.-грэч. гісторыкаў Д. называўся *Барысфен*. У 4—7 ст. н. э. ў бас. Д. жылі *анты*. У 2-й пал. 1-га тысячагоддзя сярэдняе цячэнне Д. насялялі *паляне*, бас. Дзвіны і Сейма — *севяране*, паміж Д. і Сожам жылі *радзімічы*, паміж Прыпяццю, Зах. Дзвіною і Д.— *дрыгавічы*, у вярхоўях Д., Зах. Дзвіны і Волгі — *крывічы*. Па Д. праходзіў *шлях з вараг'яў у грэкі*». У 2-й пал. 9 ст. ў Сярэднім і Верхнім Падняпроўі ўзнікла раннефеад. дзяржава *Кіеўская Русь*. Ніжняе цячэнне Д. да сярэдзіны 11 ст. займалі *печанегі*, пазней полаўцы. Пасля распаду Кіеўскай Русі ў бас. Д. ўзніклі Смаленскае, Чарнігава-Северскае, Тураўскае, Пінскае, Кіеўскае, Пераяслаўскае княствы. З 40-х г. 13 ст. Ніжняе і Сярэдняе Падняпроўе пад уладай мангола-татараў. У 14 ст. амаль усё Падняпроўе далучана да *Вялікага княства Літоўскага*. У пач. 16 ст. вярхоўе Д. і Чарнігава-Северская зямля адышлі да Вял. кн. Маскоўскага, але паводле *Дэулінскага перамір'я 1618* зноў пад уладай Вял. кн. Літ. і Польшчы. Пасля *Люблінскай уніі 1569* укр. Падняпроўе ўключана ў *Рэч Паспалітую*. У ніжнім цячэнні Д. ў канцы 15 ст. паявіліся казацкія паселішчы, у сярэдзіне 16 ст.— *Сеч Запорожская*. У 90-п г. 16 ст. ў Сярэднім Падняпроўі выбухнулі сялянскія і казацкія паўстанні пад кіраўніцтвам К. Касінскага, С. *Налівайкі* і інш. Нар. масы ўкр. і бел. Падняпроўя актыўна ўдзельнічалі ў *вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—54*. Паводле *Андрусаўскага перамір'я 1667* да Рус. дзяржавы далучаны Смаленскае ваяводства, левабярэжная Украіна з Кіевам. Па Сярэднім Д. праходзіла мяжа паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Нізоўе Д. знаходзілася пад уплывам крымскага хана. Пасля 1-га (1772) і 2-га (1793) падзелаў Рэчы Паспалітай і рус.-тур. войны 1768—74 увесь бас. Д. ў складзе Расійскай імперыі. У 1735—39, з 1919 і ў Вял. Айч. вайну на Д. дзейнічала *Дняпроўская ваенная флатылія*. У 1941 Падняпроўе акупавана ням.-фаш. захопнікамі. У выніку *Смаленскай аперацыі 1943*, *Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943*, Чарнігава-Прыпяцкай, Кіеўскай наступальнай аперацыі, Жытомірска-Бярдзічаўскай аперацыі 1943 Падняпроўе вызвалена ад ням.-фаш. акупантаў, разгромлена 60 варожых дывізій. Больш як 2 тыс. сав. воінаў, што ўдзельнічалі ў бітве за Д., прысвоена званне Герояў Сав. Саюза.

Звычайна Д. падзяляецца на 3 часткі: верхняе цячэнне (ад вытоку да Кіева), сярэдняе (ад Кіева да Запарожжа) і ніжняе (ад Запарожжа да вусця). Некат. даследчыкі за верхняе цячэнне лічаць участак ад вытоку да вусця Прыпяці; іншыя ўвесь участак Д. ў межах БССР адносяць да сярэдняга цячэння. Выток Д.— невялікае балота за 75 км на ПнУ ад Вязьмы ў Смаленскай вобл. РСФСР, на выш. 240 м над узр. м. У вярхоўі Д. цячэ ў лясістых, нізкіх, забалочаных берагах, складзеных з валунных суглінкаў; ніжэй па дачэнні на Пн БССР сярод узгорыстай мясцовасці, месцамі прарэзвае дэвонскія даламітызаваныя вапнякі. Рэчышча звілістае, трапляюцца нагрувашчванні валуноў, ёсць пераката. За 9 км вышэй Оршы знаходзяцца Кабыляцкія парогі. Даліна тут вузкая (0,5—1 км), ніжэй па цячэнні да 1—2 км. У межах Аршанска-Магілёўскай раўніны Д. прарэзвае тоўшчу марэнных адкладаў. Даліна добра выпрацавана, пойма шырокая (ад 1 да 3 км), рэчышча шыр. 120—150 *м*, месцамі да 300 *м*; тры выразныя надпоймавыя тэрасы ўзвышаюцца над меженным узроўнем на 6—8, 12—20 і 30—35 *м*, вышыня поймы 3—4 *м*. На Прыдняпроўскай нізіне пойма пераходзіць у плоскую раўніну, укрытую пясчанымі грывамі; шыр. рэчышча 400—500 *м*. Д. тут моцна меандрыруе, утварае шмат рукавоў і старых рэчышчаў. На ўсім працягу Прыдняпроўскай нізіны правы бераг высокі, падмыты, часам стромкі і абрывісты, левы нізкі, складзены з алювіяльных адкладаў. Глыбіні ракі ад 1,5—2 *м* (раён Оршы) да 3—4 *м* на Пд БССР. У верхнім цячэнні прытокі Д.: Друць, Бярэзіна, Прыпяць — справа, Сож, Дзясна — злева. У сярэднім цячэнні даліна Д. шыр. 6—10 км. Правы бераг узвышаны і стромка абрываецца да ракі. Па левабярэжжы добра відаць пойму і старажытныя тэрасы. Каля г. Канева даліна звужваецца да 2 км. Паміж Днепрапятроўскам і Запарожжам Д. перасякае гранітны масіў, дзе да буд-ва Днепрагэса былі Дняпроўскія парогі. У сярэднім цячэнні ў Д. упадаюць прытокі: Сула, Псёл, Ворскла, Самара — злева, Рось — справа. У нізоўі Д. цячэ па Чарнаморскай нізіне. Шыр. поймы 23 км. На Пд ад Херсона пачынаецца дэльта, дзе Д. ўтварае пратокі, дробіцца на рукавы. На гэтым участку ў Д. упадаюць Базаўлук і Інгулец — справа, Конка — злева. Жыўленне Д. мяшанае: снегавое, дажджавое, грунтавое. Па Д. каля Рэчыцы праходзіць у сак.— маі 56,6% сцёку, у чэрв.— ліст. 30,7%, у снеж.— лютым 12,7% сцёку. Сярэдні сцёк за год 53,6 км³. У час разводдзя вада над меженным узроўнем падымаецца каля Оршы ў сярэднім на 548 *см* (найб. 864 *см* у 1956), каля Магілёва на 582 *см* (найб. 728 *см* у 1931), каля Рэчыцы на 353 *см* (найб. 456 *см* у 1956). Ледастаў на Д. на тэр. БССР 130—140 дзён (з 1-й дэкады снеж. да канца сак.), на Пд УССР каля 70 дзён. Таўшчыня лёду на рацэ ў межах БССР 40—50 *см*. Сярэдні гадавы расход вады каля Смаленска 98,7 *м*³/*сек*, каля Оршы 127 *м*³/*сек*, Рэчыцы 375 *м*³/*сек*, Кіева 1370 *м*³/*сек*, у вусці 1665 *м*³/*сек*. Гадавы сцёк наносаў каля Кіева 1400 тыс. *т*. У Д. водзяцца 65 відаў рыб: шчупак, плотка, акунь, сом, мянтуз, судак, лешч, лінь, жэрах і інш.

Д. і яго прытокі выкарыстоўваюцца як асн. водны шлях БССР і УССР. Суднаходны ад вусця да Дарагабужа, на працягу 2075 *км* (у БССР эксплуатуецца 621 *км*, ад мяжы РСФСР да г. п. Любеч Чарнігаўскай вобл.). Д. злучаны з бас. Віслы *Дняпроўска-Бугскім каналам*, з бас. Нёмана *Агінскім каналам* (не дзейнічае), *Бярэзінскім каналам* (не дзейнічае) з бас. Зах. Дзвіны. Асн. грузапатокі

Дняпро каля Лоева.





Фарсіраванне Дняпра часцямі 65-й арміі каля Рэчыцы. 1943.


УССР — каменны вугаль, жал. руда, мінер. буд. матэрыялы, нафта, збожжа; у БССР — мінер. буд. матэрыялы, лес, збожжа, каменны вугаль, угнаенні і інш. У 1970 адпраўленне грузаў па Д. ў БССР 1020 тыс. *т*, прыбыццё 944 тыс. *т*, з іх мінер. буд. матэрыялы адпаведна 856,2 тыс. *т* і 863,2 тыс. *т*, лесаматэрыялы — 31,5 тыс. *т* і 68,3 тыс. *т*. Для перавозкі ўжываюцца буксірныя і несамаходныя судны. Удзельная вага Д. ў рачных перавозках БССР каля 23—25%. Дзейнічаюць (1970) 2 пасажырскія лініі: Рэчыца — Ніжняя Олба, Рэчыца — Мілаград (абслугоўваюцца цеплаходамі тыпу «Масквіч»). Перавозкі пасажыраў у 1970 склалі 278 тыс. чал. Гал. прыстані: Магілёў, Быхаў, Рагачоў, Жлобін, Рэчыца, Кіеў, Ніжнедняпроўск, порт імя Леніна, Херсон, Новая Каховка. Д. выкарыстоўваецца як важная крыніца гідраэнергіі. Пабудаваны ГЭС: Дняпроўская імя Леніна (каля 1500 тыс. *квт*), Кіеўская (350 тыс. *квт*), Крамянчугская (625 тыс. *квт*), Днепрадзяржынская (352 тыс. *квт*), Кахоўская (351 тыс. *квт*); будуецца (1971) Канеўская (420 тыс. *квт*). Створаны вадасховішчы: Возера імя Леніна (Дняпроўскае) — пл. 400 *км*², аб'ём 3,3 *км*³; Кіеўскае — пл. 922 *км*², аб'ём 3,7 *км*³; Крамянчугскае — пл. 2250 *км*², аб'ём 13,5 *км*³; Днепрадзяржынскае — пл. 567 *км*², аб'ём 2,4 *км*³; Кахоўскае — пл. 2160 *км*², аб'ём 18,2 *км*³; Канеўскае (будуецца, 1971) — пл. 675 *км*², аб'ём 3,9 *км*³. Воды Д. выкарыстоўваюцца для водазабеспячэння прамысловасці, с. гасп., насельніцтва. Пабудаваны каналы: Дняпро — Крывы Рог, першая чарга Паўн.-Крымскага, Верхне-Інгулецкая, Краснаznаменская арашальныя сістэмы. Будуецца (1971) канал Дняпро — Данбас.

Літ.: Салазанов В. В. Весенний сток рек бассейна Верхнего Днепра, Л., 1964; Швець Г. І. Стік Дніпра нижче Києва, Київ, 1957; Горецкий Г. П. Аллювиальная летопись Великого Днепра, М., 1970; Лапоногов А. Н. По Днепру. Путеводитель, М., 1970.

Н. М. Вагнер (гідраграфія), *М. В. Біч* (гістарычная даведка). Мінск.

ДНЯПРОЎСКА-БУГСКІ КАНАЛ, частка Дняпроўска-Бугскага воднага шляху, які звязвае бас. рэк Дняпра і Віслы. Знаходзіцца ў Кобрынскім, Драгічынскім, Іванаўскім і Пінскім р-нах Брэсцкай вобл. Злучае Прыпяць праз Піну (каля Пінска) з Бугам (каля Брэста). Агульная даўж. 196 *км*. Штучная частка шляху 110 *км* (ад Кобрына да в. Дубай на Піне). Вытокам канала ўмоўна лічыцца водападзельная лінія каля в. Селішча (у вусці Белазерскага канала), дзе цячэнне вады мае 2 напрамкі — на З і У. Канал складаецца з 2 частак: адна належыць да Буга (даўж. 52 *км*), другая да Прыпяці (даўж. 58 *км*). Праходзіць па плоскай, забалочанай раўніне, парэзанай старымі рачышчамі і сеткай асушальных канаў. Асн. крыніца жыўлення — пераклд вады з Прыпяці праз азёры Волянскае, Белае і Белазерскі канал. Д.-Б. к. пабудаваны ў 1775—1848. Суднаходства было магчыма толькі ў многаводны перыяд. У 1919—39 асн. збудаванні разбурыліся, канал стаў несуднаходны. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР канал рэканструяваны, у жн. 1940 пачаўся рэгулярны рух суднаў. У Вял. Айч. вайну гідразбудаванні разбураны. У 1945—46 канал адноўлены, пазней рэканструяваны. Мае 10 шлюзаў, 12 плацін і вадаспускаў. Перавозяць пераважна мінер. сыравіну, буд. матэрыялы, лес.

А. І. Цюльпанаў. Мінск.



Дняпроўска-Бугскі канал каля вёскі Перарубы Іванаўскага р-на.

ДНЯПРОЎСКА-ДАНЕЦКАЯ ЎПАДЗІНА, тэктанічная структура ў паўд.-зах. частцы Усходне-Еўрапейскай платформы. Знаходзіцца на тэр. УССР і на Пд БССР, з'яўляецца асн. часткай Прыпяцка-Дняпроўска-Данецкага аўлакагену. На ПнУ мяжуе з *Варонежскім крышталічным масівам*, на ПдЗ — з Украінскім крышталічным шчытам; на ПдУ злучаецца з Данецкім складкавым збудаваннем, на ПнЗ праз глыбока пагружаную *Лоеўскую седлавіну* зліваецца з *Прыпяцкай упадзінай*. Д.-Д. ў. мае выгляд ровападобнага прагіну, абмежаванага глыбіннымі разломамі. Даўжыня ледбольш за 700 *км*, шыр. 100—120 *км*. Макс. глыб. залягання крышталічнага фундаменту ў яе межах каля 12 *км*. Упадзіна запоўнена палеазойскімі і меза-кайназойскімі асадкавымі ўтварэннямі, якія заляг аюць на няроўнай паверхні крышталічнага фундаменту, складзенага з метамарфічных і вывергнутых парод дакембрыю. Тэктанічная будова ўпадзіны складаная. У яе межах выдзяляюць паўн. і паўд. прыбартавыя зоны ступеньчатых апусканняў і Дняпроўска-Данецкі грабен. Апошні падзяляецца на Дняпроўскі грабен, зону злучэння з Данецкім складкавым збудаваннем і Чарнігаўска-Брагінскі выступ. Ніжняя частка асадкавай тоўшчы, якая запаўняе Д.-Д. ў., змята ў складкі і перасечана разрыўнымі парушэннямі. Інтэнсіўна праявілася на тэр. ўпадзіны салянкавая тэктоніка. Развівалася ўпадзіна ўздоўж буйных разломаў у крышталічным фундаменце паўн.-зах. прасцягу. Пачатак фарміравання адносіцца да канца сярэдняга або пачатку позняга дэвону. Далейшае пагружэнне тэрыторыі адбывалася з перапынкамі да чацвярцічнага часу. Найб. інтэнсіўна сыходныя тэктанічныя рухі праявіліся ў дэвоне, карбоне і ў раннепермскі час. У асадкавай тоўшчы Д.-Д. ў. выяўлены радовішчы нафты і газу, каменных соляў, гіпсу, вугалю, мелу і інш.

Літ.: Клименко В. Я. Структура Днепровско-Донецкой впадины, условия ее формирования и закономерности образования и размещения в ней месторождений нефти и газа, Киев, 1957; Чирвинская М. В. Представление о тектонике Днепровско-Донецкой впадины на основании результатов геофизических исследований, Киев, 1959.

З. А. Гарэлік. Мінск.

ДНЯПРОЎСКАЕ АБЛЕДЗЯНЁННЕ (рыскае, максімальнае), найбольш пашыранае абледзяненне на Рускай раўніне, трэцяе ў *антрапагенавы перыяд*. Ледавік перакрываў усю тэр. Беларусі і двума вялізнымі языкамі цягнуўся па Прыдняпроўскай нізіне да шыраты г. Днепрапятроўска, а па даліне Дона — да вусця р. Мядзведзіцы. Некат. даследчыкі лічаць, што ледавік мог дайсці да Чорнага і Каспійскага м. Пл. пашырэння Д. а. вызначана С. М. Нікіціным у канцы 19 ст. па знаходках *валуноў*. Тэрмін уведзены А. П. Паўлавым у 1926.

Адклады Д. а. — шэрыя і буравата-шэрыя маранныя суглінкі і супескі — агаляюцца ў многіх месцах на Дняпры, Нёмане і інш. У марэну часта ўключаны валуны, адорвені мелу, даламіту і інш. даантрапагенавых парод. Нярэдка марэна падсцілаецца або перакрываецца пяскамі, пясчана-жвіровым матэрыялам або глінамі, утворанымі пры наступанні і адступанні ледавіка. Агульная магутнасць адкладаў Д. а. на Беларусі да некалькіх дзесяткаў метраў. На прыледавіковай тэр. Усх. Еўропы ў час Д. а. жылі трыгантэрыевы слон, эласматэрый, вярблюд Кноблаха, хазарскі конь, даўгарогі бізон, сайга, насарог Мерка і інш.

Літ.: Марков К. К. и др. Плейстоцен, М., 1968; гл. таксама літ. пры арт. *Валдайское абледенение.*

Э. А. Ляўкоў. Мінск.

ДНЯПРОЎСКАЯ ВАЕННАЯ ФЛАТЫЛІЯ, створана ў час руска-турэцкай вайны 1735—39 і ліквідавана пасля яе заканчэння. У гады Сав. улады сфарміравана ў 1919 у Кіеве. Удзельнічала ў баях з Дзянікіным, кулацка-нацыяналіст. бандамі і войскамі бурж. Польшчы. Расфарміравана ў снеж. 1920. У кастр. 1925 у Кіеве створаны атрад суднаў Д. в. ф., які ў 1926 перафарміраваны ў асобны атрад суднаў р. Дняпра (у чэрв. 1931 пераўтвораны ў Д. в. ф.). У ліп. 1940 Д. в. ф. пераўтворана ў Пінскую ваенную флатылію (частка караблёў перададзена Дунайскай ваен. флатыліі). З выхадам савецкіх войск да Дняпра адноўлена ў вер. 1943 на базе Волжскай ваеннай флатыліі. Налічвала каля 200 суднаў. Удзельнічала ў баях за вызваленне Беларусі ад ням.-фаш. захопнікаў (Бабруйска, Мазыра, Петрыкава, Пінска), Польшчы, у разгроме ням. войск на Одэры і Шпрэе, у баях за Берлін. Узнаг. ордэнамі Чырв. Сцяга і Ушакова 1-й ст., злучэнням і часцям, якія асабліва вызначыліся ў баях за вызваленне Беларусі, нададзены найменні Бабруйскіх, Пінскіх, Лунінецкіх. 21 воіну Д. в. ф. прысвоена званне Героя Сав. Саюза, у т. л. 11 за вызваленне Пінска. У Пінску створаны музей Д. в. ф. Пасля Айч. вайны расфарміравана.

Кр.: Моряки в борьбе за власть Советов на Украине (ноябрь 1917—1920 гг.). Сб. документов, Киев, 1963.

Літ.: Локтионов И. И. Пинская и Днепровская флотилии в Великой Отечественной войне, М., 1958; Боевой путь Советского Военно-Морского Флота, 2 изд., М., 1967. *В. Я. Надводскі.* Ленінград.

«ДО ВАЛЬКІ» («Do walki» «На барацьбу»), камуністычная газета, якая выдавалася ў Вільні з 20.7.1920 да вер. 1922 на польскай мове. Першапачаткова выходзіла як орган Цэнтр. і Віленскага к-таў КП Літвы і Беларусі, з 1920 (№ 35) — орган Віленскага к-та КП Літвы і Беларусі, з чэрв. 1921 да вер. 1922 — орган Віленскага акр. к-та Камуніст. партыі Літвы. Выйшла 44 нумары. У 1920—21 газету рэдагаваў В. С. *Міцкявічус-Капсукас.*

«ДО ВАЛЬКІ» («Do walki» «На барацьбу»), нелегальная газета, орган ЦК КПЗБ. Выдавалася з ліст. 1928 да жн. 1932 у Вільні на польскай мове. Была разлічана на польскіх рабочых Зах. Беларусі. Вядома 23 нумары.

ДОБАСНА, вёска ў Кіраўскім р-не Магілёўскай вобл., каля р. Дабасна (0,2 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Камуніст». За 17 *км* на ПдУ ад Кіраўска, 110 *км* ад Магілёва, 37 *км* ад чыг. ст. Бярэзіна. 581 ж., двароў 176 (1971). Лесапільня, млын, сепаратарны пункт, мех. майстэрня. Васьмігадовая школа, муз. школа. Помнік на брацкай магіле 12 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДОБІ (Dóbi) Іштван (31.12.1898—24.11.1968), паліт. і дзярж. дзеяч Венгерскай Народнай Рэспублікі. З сям'і с.-г. рабочага. Рана пачаў прац. дзейнасць (здольшчык, падзёншчык, с.-г. рабочы). У 18 гадоў удзельнік руху с.-г. рабочых. У 1919 у венг. Чырвонай Арміі. З 1922 чл. Усевенг. саюза с.-г. рабочых, з 1937 — Партыі дробных сельскіх гаспадароў (з 1947 старшыня партыі). У 2-ю сусв. вайну ўдзельнік Руху Супраціўлення. Пасля вызвалення Венгрыі ад фаш. войск на кіруючых пасадах: дзярж. міністр (1945—46), міністр земляробства (1946, 1948), у 1948—52 старшыня Савета Міністраў ВНР, у 1952—67 старшыня Прэзідыума ВНР. З 1959 чл. Венг. сацыяліст. рабочай партыі, на 7-м з'ездзе (1959) выбраны чл. ЦК. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1961.



Тв.: Рус пер.— Исповедь и история. Воспоминания, М., 1967.

ДОБРААХВО́ТНЫЯ СПАРТЫЎНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ (ДСТ), добраахвотныя арганізацыі ў СССР, якія аб'ядноўваюць грамадзян для заняткаў фізічнай культурай і спортам. Задачы ДСТ — развіццё фіз. культуры і спорту, павышэнне спарт. майстэрства, выхаванне спартсменаў. Ствараюцца паводле тэрытарыяльнай і вытворча-галіновай адзнак. Пярвічныя арг-цыі ДСТ — калектывы фізкультуры і спарт. клубы прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, навуч. устаноў. У СССР 19 ДСТ прафсаюзаў (4 усесаюзныя і 15 рэспубліканскіх), 15 прафсаюзна-кааператыўных (сельскіх) і 4 ведамасныя.

У БССР дзейнічаюць ДСТ: *«Чырвоны сцяг»* (прафсаюзнае рэспубліканскае); *«Буравеснік»*, *«Спартак»*, *«Лакаматыў»*, *«Воднік»* (усесаюзныя); *«Ураджай»* (сельскае); *«Дынама»*, *«Працоўныя рэзервы»* і прыроўненыя да іх ДТСААФ і спартыўны клуб Сав. Арміі (ведамасныя). ДСТ БССР (1971) аб'ядноўваюць больш за 2 млн. фізкультурнікаў, у т. л. 246,7 тыс. спартсменаў-разраднікаў; маюць 53 стадыёны, 40 плавальных басейнаў, 170 спартыўна-гімнастычных залаў і інш. спартыўныя збудаванні.

К. А. Кулінковіч. Мінск.

ДОБРААХВОТНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ, масавыя арганізацыі працоўных, якія ствараюцца для развіцця самадзейнасці і паліт. актыўнасці народных мас. Правы працоўных на аб'яднанне ў Д. т. гарантуюцца арт. 126 Канстытуцыі СССР і канстытуцыямі саюзных рэспублік (арт. 101 Канстытуцыі БССР). Гал. мэта Д. т.— павышэнне паліт., культ. або тэхн. ведаў працоўных, больш поўнае задавальненне розпабаковых запатрабаванняў і актыўны ўдзел у карыснай для грамадства дзейнасці.

У СССР і ў саюзных рэспубліках ёсць шэраг масавых Д. т. з аддзяленнямі ў абласцях, гарадах, раёнах, вёсках (гл. *Навукова-тэхнічныя таварыствы СССР, ДТСААФ СССР, Добраахвотныя спартыўныя таварыствы, «Веды», Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, Чырвоны Крыж, Беларускае таварыства аховы прыроды*). Існуюць таксама Д. т. пажарнікаў, паляўнічых і рыбаловаў і інш.

Літ.: Кравченко В. В. Добровольные общества в СССР и их правовое положение, М., 1964; Шабанов Ю. В. Проблемы советской социалистической демократии в период строительства коммунизма, Мн., 1969.

Н. А. Столяр. Мінск.

ДОБРАВІЧЫ, вёска ў Жарскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Добравічы». За 38 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 141 *км* ад Мінска, 24 *км* ад чыг. ст. Княгініна. 305 ж., гасп. 97 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, швейная майстэрня, магазін. Помнік 15 землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ НАСЕЛЕНЫХ МЕСЦАЎ, стварэнне жыццёвых выгод насельніцтву гарадоў, гар. пасёлкаў, вёсак, курортаў і месцаў масавага адпачынку. Уключае планіроўку і забудову, дарожнае буд-ва, развіццё *гарадскога транспарту, водазабеспячэн-*

не, каналізацыю, газіфікацыю, азеляненне населеных месцаў, паляпшэнне мікраклімату, ахову паветра, адкрытых вадаёмаў і глебы ад забруджвання, сан. ачыстку, памяншэнне гар. шуму і інш.

Высокі ўзровень Д. п. м. у СССР абумоўлены рацыянальнай іх планіроўкай, комплекснай арг-цыяй вытворчых зон, жылых раёнаў, сеткі грамадскіх і культ.-бытавых устаноў, што стварае найб. спрыяльныя ўмовы працы, быту, грамадскай дзейнасці і адпачынку працоўных. Буд-ва новых гарадоў і пасёлкаў, рэканструкцыя старых ажыццяўляюцца паводле ген. планаў (гл. *Горадабудаўніцтва*), якія прадугледжваюць поўны комплекс



Добруш. Галоўная плошча.

выгод для насельніцтва. Новыя прамысл. прадпрыемствы, чыг. станцыі і вузлы, ЦЭЦ будуюць за межамі жылых раёнаў па тэхнал. схемах, якія засцерагаюць ад забруджвання паветра і вадаёмы; апаратура герметызуецца; арганізуецца рацыянальная транспартная сувязь. Вял. работу па Д. п. м. выконвае *камунальная гаспадарка*, гар. транспарт, камунальная сетка, быт. прадпрыемствы і камунальная энергетыка (*цеплафікацыя*, электра- і газазабеспячэнне). На тэр. жылой забудовы комплексна добраўпарадкоўваюцца мікрараёны, дзе побач з жыллём азеляняюцца ўчасткі, школы і дзіцячыя ўстановы, алеі, пляцоўкі для адпачынку і інш. Жылыя дамы і культ.-бытавыя ўстановы размяшчаюцца паводле сан.-гігіенічных патрабаванняў праветрывання тэрыторыі, інсаляцыі памяшканняў і аптымальнай шчыльнасці забудовы (у СССР не болей за 4,5—5,0 тыс. м² жылой плошчы на гектар тэр. мікрараёна). Некалькі мікрараёнаў групуюцца ў зоне ўстаноў абслугоўвання раённага значэння (кінатэатр, універмаг, паліклініка), спарт. збудаванняў і парку. Вял. ўвага аддаецца добраўпарадкаванню агульнагарадскога, пасялковага, вясковага цэнтраў і іх гал. плошчаў, дзе звычайна размяшчаюцца адм. і грамадскія будынкі, скверы, фантаны. Паблізу гарадоў вызначаюцца прыгарадныя і зялёныя зоны. З інтэнсіфікацыяй гар. руху пашыраюцца работы па добраўпарадкаванні вуліц: будуюцца магістралі з падземнымі пераходамі, аўтам. сістэмамі рэгулявання руху.

Літ.: Страментов А. Е. и Бутягин В. А. Планировка и благоустройство городов, 2 изд., М., 1962; Основы планировочной организации и расчета системы загородного отдыха населения БССР (Рекомендации по проектированию), Мн., 1965 (бібліягр.); Бутько И. Т. Благоустройство сельского населенного пункта, Мн., 1958; Коробкин И. Т. Из опыта планирования сельских населенных пунктов в БССР, Мн., 1959 (бібліягр.); Быту и культуре села — повседневное внимание, Мн., 1969.

Э. А. Юшкевіч. Мінск.

ДОБРАЯ, вёска ў Панкратаўскім с/с Горацкага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Дабранка. Цэнтр калгаса «Праўда». За 12 *км* на Пд ад Горак, 70 *км* ад Магілёва, 9 *км* ад чыг. ст. Пагодзіна, каля шашы Магілёў — в. Княжыцы — Горкі (2 *км*). 298 ж., двароў 90 (1971). Пач. школа, Дом культуры, б-ка, швейная майстэрня, сталовая, магазін. Помнік 265 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДОБРАЯ ВОЛЯ, вёска ў Аснежыцкім с/с Пінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Добрая Воля». За 6 *км* на Пн ад Пінска, 181 *км* ад Брэста, каля шашы Пінск — Іванцэвічы (3 *км*). 185 ж., гасп. 45 (1971). Б-ка, магазін.

ДОБРУШ, горад (з 1935), цэнтр Добрушскага р-на Гомельскай вобл., на р. Іпуць. Чыг. ст. на лініі Гомель — Навазыбкаў. За 28 *км* на У ад Гомеля. 17,2 тыс. ж. (1971).

Упершыню ўпамінаецца ў дакументах пад 1640 як вёска Гомельскага староства. З 1772 Д. у складзе Рас. імперыі, мястэчка Магілёўскай губ., вядомае вырабамі канатаў і парусаў. Да 1834 належала графу Румянцаву, пазней кн. Паскевічу, які заснаваў у Д. паперню. З 1903 у Д. дзейнічала група РСДРП. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У сак.— снеж. 1918 акупаваны ням. войскамі. У Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (22.8.1941—10.10.1943) і разбураны. Пасля вайны адноўлены.

Падвесная дарога для падачы паліўнага торфу на цэлюлозна-папяровы камбінат у Добрушы.




Прадпрыемствы: *Добрушскі цэлюлозна-папяровы камбінат*, з-д масла і сухога малака, хлебазавод, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, будуецца (1971) цэлюлозны з-д. 3 сярэднія, 2 васьмігадовыя, пачатковая школы, школа рабочай моладзі, прафес.-тэхн. вуч. кінамеханікаў, муз. і дзіцячая спарт. школы, 5 дашкольных устаноў, Дом піянераў, 3 кінатэатры, 3 б-кі, бальніца. Помнік на магіле чырвонагвардзейцаў і партызанаў, якія загінулі ў 1918. 4 помнікі сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДОБРУШСКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 8.12.1926. На У вобласці. Пл. 1,5 тыс. км². Нас. 64,3 тыс. чал. (1971, з Добрушам). Падзяляецца на 18 сельсаветаў; г. п. Церахоўка. Цэнтр г. Добруш.

Тэр. раёна ў межах *Гомельскага Палесся*. Рэльеф раўнінны. Выш. 140—160 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 6,3 млн. *т*, у т. л. радовішча Галае — 5,6 млн. *т*; радовішча фармовачных і шкляных пяскоў (в. Леніна)—52 млн. *т*; 3 радовішчы цагельнай сыравіны — 1,1 млн. *м*³, у т. л. радовішча Церахоўка — 0,54 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —6,9, ліп. 18,6 °С. Ападкаў 590 *мм* за год. Вегет. перыяд 193 дні. Рэкі Іпуць з прытокамі Хорапуць і Няцёша, Вуць (прыток Сажа). На Пн раёна воз. Равучае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (54,5%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (21,7%), дзярнова-балотныя (8%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя (14,3%). З мінер. глебаў 41,8% суглінкавых, 41,5 супясчаных, 16,7% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 45 (цана бала 0,25 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 26, усіх с.-г. угоддзяў — 38. Пад лесам 20,4% тэр. Пераважаюць хвойныя (хвоя, елка), трапляецца лістоўніца; з лісцевых дуб, ясень, клён, ліпа, бяроза, вольха, асіна. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы і інш. Сярэдняя шчыльн. 43 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 30% (з Добрушам).

Прамысловасць: папяровая, харчовая, буд. матэрыялаў і інш. Прадпрыемствы: *Добрушскі цэлюлозна-папяровы камбінат*, з-д па вытворчасці масла і абястлушчанага сухога малака (Добруш), хлебазаводы (Добруш, Церахоўка), з-д масла і сухога малака (Церахоўка), камбінат буд. матэрыялаў (цагельні ў в. Крупец і Васільеўка), ф-ка па здабычы і абагачэнні кварцавых пяскоў у в. Леніна, торфапрадпрыемства «Стаханавец», ільнозавод (Церахоўка), камбінат быт. абслугоўвання, 2 майстэрні раённага аб'яднання Сельгастэхнікі (Добруш, Церахоўка). У раёне 20 калгасаў і 5 саўгасаў (1971).


Калгасы і іх цэнтры: «Абарона» (*Карма*), «Беларусь» (*Крупец*), імя Гагарына (*Васільеўка*), «Дружба» (*Дубовы Лог*), «Зара камунізма» (*Кузьмінічы*), імя Калініна (*Перарост*), імя Кірава (*Хорашаўка*), імя Леніна (*Леніна*), «Ленінскі шлях» (*Чырвоная Буда*), «Молат» (*Дзям'янкі*), «Перамога» (*Баршчоўка*), «Світанне» (*Кругоўка*), імя Суворава (*Усохская Буда*), імя Фрунзе (*Усохі*), імя Чкалава (*Завідаўка*), «Чырвоная ніва» (*Ніўкі*), «Чырвоны Кастрычнік» (*Церахоўка*), «Чырвоны Партызан» (*Чырвоны Партызан*), «Шлях да камунізма» (*Вуць*), «Юбілейны» (*Марозаўка*). Саўгасы і іх цэнтры: «Добрушскі» (*Добруш*), «Жгунскі» (*Жгунь*), «Іванкі» (*Іванкі*), «Насовічы» (*Насовічы*), «Новы шлях» (*Іваўка*).



Сельгасугоддзі пл. (тыс. *га*, 1970) 59,6, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 26,2, бульбай 9,8, тэхнічнымі (лён) 1,6, кармавымі 21,7. Развіта садоўніцтва. На пач. 1970 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 50,4, у т. л. кароў 24,1; свіней 38,5, авечак і коз 6,0. Тэр. раёна перасякаюць чыгункі Гомель — Бранск, Гомель — Бахмач і шашэйная дарога Гомель — Добруш — Навазыбкаў.

У раёне ў 1970 (з Добрушам) было 17 сярэдніх, 21 васьмігадовая, 29 пачатковых школ, 2 школы рабочай і сельскай моладзі; 10 дашкольных устаноў, прафес.-тэхн. вуч. кінамеханікаў, 50 клубных устаноў, 49 масавых б-к, 47 кінаўстановак (у т. л. 43 стацыянарныя),

Статак авечак у саўгасе «Насовічы».



10 бальніц, 2 паліклінікі, радзільны дом, 23 фельч.-ак. пункты. У 1971 у раёне (з Добрушам) 744 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 78 інжынераў, 32 аграномы, 24 заатэхнікі, 16 эканамістаў, 8 вет. урачоў, 535 настаўнікаў, 51 урач; 1075 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Ленінец».

Н. П. Сідарэнаў. Добруш.

ДОБРУШСКІ ЦЭЛЮЛОЗНА-ПАПЯРОВЫ КАМБІНАТ «Герой працы», прадпрыемства цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Асн. прадукцыя: папера чарцёжная, сшыткі, кардон, папярова-белавыя вырабы, аснова для святлоадчувальнай паперы і інш. Працуе на прывазной цэлюлозе. Уступіў у строй як папяровая ф-ка ў 1872. У 1913 выпушчана 10,2 тыс. *т* паперы, у 1921—1,8 тыс. *т*. У 1922 прысвоена званне «Герой працы». У 1923 уведзены ў строй сшыткавы цэх, у 1932 драўнінна-цэлюлозны, у 1937 саламяна-цэлюлозны з-ды. У Вял. Айч. вайну ф-ка эвакуіравана. У 1943 пачалося аднаўленне ў Добрушы. Да 1953 пушчаны ўсе 6 папераробных машын. У 1953 выпуск паперы дасягнуў даваеннага ўзроўню (36 тыс. *т* за год). У 1960—66 праведзены рэканструкцыя і тэхн. перааснашчэнне камбіната. Мадэрнізаваны папераробныя машыны, удасканалена тэхналогія вытворчасці. Асн. цэхі: папяровы, сшыткавы, папярова-белавых вырабаў, кардонны, палівачны. Будуецца (1971) цэлюлозны з-д. У 1970 камбінат выпусціў 56,6 тыс. *т* паперы, у т. л. 10,1 тыс. *т* чарцёжнай і 5,6 тыс. *т* паперы для малявання. Прадукцыя ідзе таксама на экспарт. У 1929 узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга Беларускай ССР. Пры камбінаце жылы пасёлак, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, спарт. комплекс, піянерскі лагер, дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

Літ.: Ковшаров Н. Добрушский целлюлозно-бумажный, Мн., 1970. *В. І. Саліта.* Добруш.


ДОБРЫ БОР, неалітычнае паселішча нёманскай культуры на правым беразе Шчары каля в. Добры Бор Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Адкрыта А. Р. Мітрафанавым (1951), даследавалася В. В. Рыжкоўскай і І. М. Цюрынай (1960). Пры раскопках выяўлена 12 агнішчаў, 3 паўзямлянкі чатырохвугольнай формы, 2 гасп. ямы, крамяняўвыя прылады працы і фрагменты познанеаліт. керамікі. Частка знаходак бронзавага веку.

Літ.: Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии, в. 1 — Памятники каменного века, Мн., 1968.

ДОБРЫХ Леанід Іванавіч (н. 15.12.1932, в. Добрыя Верхашыжамскага р-на Ніжагародскага краю), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1968). Чл. КПСС з 1962. Скончыў Горкаўскі політэхн. ін-т (1955). Да 1960 у аддзеле гал. канструктара Мінскага аўтазавода. З 1960 на Бел. аўтазаводзе, з кастр. 1970 нам. гал. інжынера па новай тэхніцы. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні уніфікаваных вялікагрузных аўтамабіляў для адкрытых распрацовак карысных выкапняў і буд-ва і ў асваенні іх серыйнай вытворчасці.

ДОБРЫЧ, рака, правы прыток Сажа (бас. Дняпра). Даўж. 36 *км*. Цячэ ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Вадазбор (234 км²) на Пд Аршанска-Магілёўскай раўніны. Паверхня хвалістая, слаба перасечаная. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,1 *м³/сек*.

ДОБЫШ Фёдар Іванавіч [н. 20.2(5.3).1906, в. Коханава Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.], генерал-палкоўнік (1962). З сялян. Чл. КПСС з 1929. У Чырв. Арміі з 1928. Скончыў Аб'яднаную бел. ваен. школу (1931), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1951). Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну на Зах., Калінінскім, Волхаўскім, Паўн.-Зах., Варонежскім, 2-м і 1-м Укр. франтах — камандзір бамбардзіровачнага авіяц. палка, дывізіі. Удзельнік абароны Ленінграда, вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, Берлінскай аперацыі. Узнаг. 4 ордэнамі Леніна, 7 інш. ордэнамі, медалямі, 2 ордэнамі замежных краін. Служыць у Сав. Арміі.



ДОГЕЛЬ Мацей (6.8.1715, в. Гембулы Лідскага пав. Віленскай губ.— 24.2.1760), гісторык-археограф. Выявіў і сабраў у фамільных і дзярж. архівах і б-ках Польшчы, Вял. кн. Літ., Германіі, Францыі і Галандыі многа арыгіналаў гістар. і дыпламат. дакументаў і частку выдаў пад назвай «Дыпламатычны кодэкс Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага». Нявыдадзеныя дакументы (5 тамоў) у рукапісах паступілі ў каралеўскую б-ку (Варшава), потым у Віленскі ун-т, а адтуль у Пецярбургскую публічную бібліятэку. Імі карыстаўся польскі гісторык А. Нарушэвіч пры напісанні «Гісторыі польскага народа». Д. выдаў зборнік пагранічных канвенцый «Граніцы Польскага каралеўства і Вялікага княства Літоўскага» («Limites Regni Poloniae et Magni Ducatus Lituaniae», Вільня, 1758). Яго зборнікі змяшчалі матэрыялы па гісторыі міжнар. адносін Польшчы, Літвы і Беларусі за 13—18 ст. і не страцілі свайго значэння як гістар. крыніцы да нашых дзён. Каментарыяў зместу дакументаў не даваў.

ДОЖДЖ, атмасферныя ападкі, якія выпадаюць на паверхню зямлі ў выглядзе кропель вады.

Утвараецца ад кандэнсацыі вадзяной пары ў паветры і выпадае з воблакаў, калі дробныя кроплі аліваюцца ў больш буйныя. Д. з дыяметрам кропель менш за 0,5 *мм* наз. *імжою*. У воблаках бываюць таксама крышталікі лёду, якія хутка большаюць за кошт кандэнсацыі пары на іх паверхні, праходзяць праз цёплыя слаі паветра і падаюць як буйныя кроплі дыяметрам ад 0,5 да 8 *мм*. Калі кроплі трапляюць з цёплага слоя атмасферы ў халодны, ідзе ледзяны Д. Некаторыя рэчывы, што трапляюць у высокія слаі атмасферы, могуць афарбаваць кроплі Д. ў жоўты, чырвоны, аранжавы і інш. колеры. Дзейнічаючы на воблакі цвёрдай вугляніслатой, парай ёдзістага серабра і інш. рэагентамі, можна выклікаць штучны Д. Бывае заложны Д., які ідзе бесперапынна некалькі гадзін або сутак, і лівень — моцны кароткачасовы Д., часта з градам з кучавадажджавых воблакаў. Усе навальнічныя Д.— ліўневыя. Перыядычнасць і інтэнсіўнасць Д. маюць вял. значэнне для с. гасп. Інтэнсіўнасць характарызуецца колькасцю вады ў *мм/мін* (1 *мм/мін* і больш — лівень). На Беларусі ў сярэднім за год бывае вадкіх ападкаў 80% на ПдЗ і 70% на ПнУ. Колькасць дзён з Д. у год на ПдУ 100—105, на ПнЗ 110—115. Працягласць Д. ў дзень летам 3—4,5 *гадз*. Гл. таксама *Ападкі атмасферныя*.

Літ.: Тверской П. Н. Курс метеорологии (физика атмосферы), Л., 1962; Сулаквелидзе Г. К. Ливневые осадки и град, Л., 1967.

А. Х. Шкляр. Мінск.

ДОЗЫ АПРАМЯНЕННЯ КРЫТЫЧНЫЯ, гл. *Апрамяненне*.

ДОЙЛ (Doyle) Артур Конан (22.5.1859, Эдынбург — 7.7.1930), англійскі пісьменнік. Па адукацыі ўрач. Сусв. вядомасць набылі дэтэктыўныя апавяданні і аповесці Д., аб'яднаныя вобразам Шэрлака Холмса (зб. апавяданняў «Прыгоды Шэрлака Холмса», 1892; аповесць «Сабака Баскервіляў», 1902, і інш.). Аўтар прыгодніцкіх і гістар. («Выгнаннікі», 1893, «Подзвігі брыгадзіра Жэрара», 1895), навук.-фантастычных («Згублены свет», 1912, «Маракотава бездань», 1929) раманаў.

Тв.: Собр. соч., т. 1—8, М., 1966.

ДОЙЛІДСТВА, гл. *Архітэктура*.

ДОЙНІЧАВА, вёска ў Осаўскім с/с Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр саўгаса «Дойнічава». За 32 *км* на З ад Бабруйска, 142 *км* ад Магілёва, 25 *км* ад чыг. ст. Татарка, каля шашы Слуцк — Бабруйск (2 *км*). 363 ж., гасп. 112 (1971). Клуб, б-ка, дзіцячыя яслі і сад, фельч.-ак. пункт, швейная майстэрня, сталовая, магазін, гасцініца.

ДОПЧЭ ПРЭСЭ АГЕНТУР (ДПА) (Deutsche Presse-Agentur), інфармацыйнае агенцтва ФРГ.

Засн. ў 1949, адміністрацыя ў Гамбургу. ДПА — акцыянернае т-ва, асн. пайшчыкамі з'яўляюцца ўладальнікі ўсіх найб. значных буржуазных газет і радыёкампаній ФРГ. Кіруючыя органы ДПА — Наглядальны савет і К-т саветнікаў. Мае разгалінаваную сетку аддзяленняў, карэспандэнцкіх пунктаў і прадстаўніцтваў ва ўсіх вял. гарадах краіны і каля 100 карэспандэнтаў за мяжой, у т. л. і ў СССР. Звязаны дагаворамі з многімі агенцтвамі свету. Інфармацыя ДПА прасякнута бурж. тэндэнцыйнасцю, імкненнем абараніць і абагуліць капіталіст. лад, дыскрэдытаваць дасягненні сацыялістычных краін.

М. Ф. Дубянецкі. Мінск.

ДОК (англ. dock), збудаванне для рамонту падводнай часткі суднаў.

Асноўныя тыпы Д.: сухі, наліўны і плывучы. Сухі Д.— басейн на беразе мора (ракі), злучаны з морам *шлюзам*. Дно сухога Д. ніжэйшае за ўзровень акваторыі, таму пры адкрытай засаўцы шлюза Д. запаўняецца вадою; потым у Д. заводзяць судна, закрываюць засаўку шлюза і з Д. адпампоўваюць ваду, каб падводная частка судна агалілася для рамонту. У наліўны Д. напампоўваюць ваду, каб падняць судна для рамонту на стапельныя пляцоўкі. Сухі і наліўны Д. з'яўляюцца прыналежнасцю *верфі*. Плывучы Д. складаецца з пантона і вежаў, падзеленых на адсекі. Адсекі запаўняюцца вадою, пантон апускаецца пад ваду настолькі, каб судна магло зайсці ў Д.; потым з адсекаў адпампоўваюць ваду, і Д. усплывае разам з суднам, падводная частка якога робіцца даступнай для рамонту.

Літ.: Вахарловский Г. А., Кучерявенко П. Ф. и Бузик В. Ф. Современные доковые сооружения для крупных и средних судов, Л., 1968.

ДОКАЗ І АБВЯРЖЭННЕ, лагічныя дзеянні, якія абгрунтоўваюць ісціннасць той ці іншай думкі (доказ) або яе няісціннасць (абвяржэнне). У лагічнай структуры доказу вызначаюцца тры элементы: тэзіс (суджэнне, ісцінасць якога абгрунтоўваецца), аргументы, ці падставы (суджэнні, з дапамогай якіх абгрунтоўваецца тэзіс), і дэманстрацыя (выснова ці ланцуг высноў, з дапамогай якіх тэзіс выводзіцца з аргументаў). Можа быць прамы доказ, г. зн. такі, калі тэзіс непасрэдна абгрунтоўваецца аргументамі, і *ўскосны доказ*.

Каб адрозніваць правільныя доказы ад няправільных, выпрацаваны асобныя правілы і выяўлены асн. памылкі пры іх парушэнні. Правілы доказу: тэзіс павінен быць эразумелы і дакладна азначаны; павінен быць адным і тым жа на працягу ўсяго доказу (парушэнне гэтага правіла наз. «падменай тэзіса»); аргументы павінны быць ісцінnымі і даказанымі (калі хоць адзін з аргументаў няісцінны, бывае «падстаўная памылка», а калі не даказаны — «аплрэджанне падставы»); аргументы павінны быць суджэннямі, ісцінасць якіх вызначана незалежна ад тэзіса (парушэнне гэтага наз. «кругам у доказе»); тэзіс павінен лагічна вынікаць з аргументаў, г. зн. дэманстрацыя складаецца з правільных высноў (пры парушэнні гэтага правіла магчымы памылкі — «улўнае вынікненне», «ад сказанага з умовай да сказанага безумоўна», «пачацвярэнне тэрмінаў»). Магчымы доказ, які сцвярджае ісцінnасць тэзіса не з дакладнасцю, а з некаторай імавернасцю. Доказамі не з'яўляюцца сафістычныя прыёмы, з дапамогай якіх спрабуюць уздзейнічаць не на розум людзей, а на іх волю ці пачуцці («аргумент да чалавека», «довад да публікі»). Абвяржэнне можна разглядаць як прыватны выпадак доказу, менавіта як доказ адмаўлення дадзенага суджэння. Па сваёй лагічнай структуры абвяржэнне не адрозніваецца ад доказу. Існуе тры тыпы абвяржэнняў: а) абвяржэнне тэзіса, якое заключаецца або ў лагічным вывядзенні няісцінных вынікаў з гэтага тэзіса («прывядзенне да абсурду»), або ў доказе антытэзіса; б) абвяржэнне аргументаў, пры якім вызначаецца няісцінnасць аргументаў; в) абвяржэнне сувязі тэзіса з аргументамі, якое азначае няслушнасць дэманстрацыі.

Літ.: Асмус В. Ф. Учение логики о доказательстве и опровержении, М., 1954.

У. Ф. Бяркоў. Мінск.

ДОКАЗЫ (у праве), здабытыя ў вызначаным законам парадку фактычныя звесткі, якія сведчаць пра злачынства, вінаватасць або невінаватасць абвінавачанага і інш. абставіны крымінальнай справы. На падставе Д. органы дазнання, следчы і суд вызначаюць наяўнасць або адсутнасць грамадска небяспечнага дзеяння, вінаватасць асобы, якая зрабіла гэтае дзеянне, і інш.

Д. па грамадз. справе — любыя фактычныя звесткі, якія ляжаць у аснове іску, або пярэчанні супраць іскавых патрабаванняў. У сав. грамадз. працэсе кожны бок абгрунтоўвае абставіны, на якія ён спасылаецца як на аснову сваіх патрабаванняў або пярэчанняў. Аднак, калі бакі і асобы, што ўдзельнічаюць у справе, не дадуць усіх патрэбных Д., суд сам павінен зрабіць захады для іх даследавання. Збіраць і даследаваць Д. па крымін. справе абавязаны органы следства, пракурор і суд. Паводле асноў крымін. і грамадз. судаводства ў сав. працэсе ацэнка Д. грунтуецца на ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным разглядзе ўсіх абставін справы ў іх сукупнасці, што дае магчымасць органам следства, пракуратуры і суду прыняць рашэнне, адпаведнае ісціне. Сав. тэорыя доказаў сцвярджае, што ў суд. справах ісціна дасягальная. Бурж. прававая навука адмаўляе магчымасць дасягнення аб'ектыўнай ісціны ў суд. дзейнасці. Пашыраны погляд, быццам суд арганічна пазбаўлены магчымасці з поўнай верагоднасцю вызначаць факты і абставіны суд. справ. Такія сцверджанні апраўдваюць суд. самавольства імперыялістаў і

іх паслугачоў у адносінах да працоўных, прыхільнікаў міру і дэмакратыі.

Літ.: Теория доказательств в советском уголовном процессе. Часть общая, М., 1966; Николайчик Н. И. и Матвиенко Е. А. Всесторонность, полнота и объективность предварительного расследования, Мн., 1969; Курылев С. В. Основы теории доказывания в советском правосудии, Мн., 1969.

М. П. Мітрохін. Мінск.

«ДОКЛАДЫ АКАДЕМІІ НАУК БССР», штомесячны навуковы часопіс АН БССР, які выдаецца ў Мінску з 1957 на рус. мове (замест друкуецца і на англ. мове). Разлічаны на навук. і інж.-тахн. работнікаў НДІ, выкладчыкаў і аспірантаў ВНУ. Друкуе паведамленні пра вынікі навук. даследаванняў у галіне матэматыкі, прыродазнаўства і тэхнікі, выкананых у НДІ АН БССР, у ВНУ і н.-д. установах рэспублікі. Гал. редактары: з 1957 — акад. АН БССР В. Ф. Купрэвіч, з 1969 (з № 7) — акад. АН БССР М. А. Барысевіч.

А. У. Янголь. Мінск.

«ДОКЛАДЫ АКАДЕМІІ НАУК СССР», навуковы часопіс АН СССР, выдаецца ў Маскве. «Доклады Академии Наук СССР. Новая серия» выходзіць з 1933 тры разы на месяц на рус. мове. Фактычна з'яўляецца працягам час. «Доклады Академии наук СССР» (серыі «А» і «В»), які выходзіў з 1922 (да 1925 паз. «Доклады Российской Академии Наук»). Друкуе паведамленні пра вынікі навук. даследаванняў у галіне прыродазнаўства і тэхнікі, выкананых у НДІ АН СССР, уп-тах, АН саюзных рэспублік, у ВНУ і галіновых НДІ СССР.

ДОКТАР НАВУК, вышэйшая вучоная ступень у СССР. Прысуджаецца па пэўных галінах навук асобам, якія маюць вучоную ступень кандыдата навук ці вучонае званне прафесара і публічна абаранілі *дысертацыю*, надрукаваныя працы, вынаходкі і адкрыцці, закончаныя працы па стварэнні новых машын, сістэм кіравання, прылад, збудаванняў і і тэхнал. працэсаў (выкананыя індывідуальна і калектыўна), падручнік (напісаны без сааўтарства). У выключных выпадках вучоная ступень Д. н. можа прысуджацца без абароны дысертацыі (працы) асобам, шырока вядомым выдатнымі навук. працамі, адкрыццямі, вынаходкамі. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені Д. н. павінна быць самастойнай даследчай працай, мець тэарэт. абагульненне і вырашэнне значнай навук. праблемы, якая а'яўляецца пэўным укладам у навуку і практыку.

Вучоныя ступені Д. н. прысуджаюцца *Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй* пры Мін-ве вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі СССР па хадайніцтве вучоных саветаў ВНУ ці НДІ, якія маюць права прымаць да абароны доктарскія дысертацыі (працы, падручнікі) па навуках: фізіка-матэматычных, хім., біял., геолага-мінералагічных, тэхн., с.-г., гіст., эканам., філас., філал., геагр., юрыд., пед., псіхалагічных, мед., фармацэўтычных, вет., ваен., ваенна-марскіх, па мастацтве і архітэктуры. У СССР прысвойваецца з 1934. У 1970 Д. н. 22 тыс. чал., у т. л. ў БССР — 426 (ран Д. н., якія працуюць у БССР, гл. асобныя біягр. артыкулы).

Вучоная ступень Д. н. існуе ў многіх замежных краінах. У Вялікабрытаніі, ЗША, Францыі і інш. краінах патрабаванні да доктарскіх дысертацый эквівалентныя патрабаванням да кандыдацкіх дысертацый у СССР (эрэдку — да доктарскіх).

І. І. Леановіч. Мінск.

ДОКШЫЦКІ РАЁН, у складзе Віцебскай вобл. Утвораны 15.1.1940. На ПдЗ вобласці, у верхнім цячэнні р. Бярэзіны (бас. Дняпра). Пл. 2,2 тыс. *км²*. Нас. 49,8 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 10 сельсаветаў; г. п. Бягомль. Цэнтр г. Докшыцы.

Паверхня раёна занята Верхнебярэзінскай нізінай. На крайнім ПнЗ — Свіцянскія грады, на З — Нарачана-Вілейская нізіна, на Пд — адгор'і Мінскага ўзв. Пераважныя выш. 150—200 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 5 радовішчаў торфу з агульнымі запасамі 88,7 млн. *т*, у т. л. радовішчы Жураўлёўскае — 28,4 млн. *т*, Сэрвач — 26,7 млн. *т* і Казённае — 15 млн. *т*; 3 радовішчы цагельнай сыравіны — 3,1 млн. *м³*, у т. л. радовішчы Варганы — 1,6 млн. *м³* і Стралкоўскае (паблізу Крулеўшчыны) — 1 млн. *м³*; 5 радовішчаў пясчана-жвіровага матэрыялу — 35,5 млн. *м³*, у т. л. радовішчы Крулеўшчына — 28,6 млн. *м³* і Камуністычнае (паблізу в. Гічанцы) — 5,4 млн. *м³*. Сярэдняя т-ра студз. —7,2, ліп. 17,3 °С. Ападкаў за год 623 *мм*. Вегет. перыяд 183 дні.



Краявід каля вёскі Таргуны.

У раёне пачынаюцца і цякуць рэкі Бярэзіна з Поняй, Вілія і Сэрвач. Азёры: Сэрвач на крайнім ПнЗ; Медзазол і Межужол на Пн; Вольшыца, Плаўна і Манец на У. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (37%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (33,5%), дзярнова-карбанатныя забалачальныя (5,1%), тарфяна-балотныя (14,5%), алювіяльныя (9,1%) і інш. З мінер. глебаў 68,3% супясчаных, 23,2 суглінкавых, 8,5% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 36 (цана бала 0,42 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 21, усіх с.-г. угоддзяў — 30. Пад лесам 42,5% тэр. Найб. лясістасць на ПнУ. Лясы пераважаюць хвойныя з прымессю вольхі і асіны. На У ў межах раёна частка *Бярэзінскага дзяржаўнага запаведніка*. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія і інш. Сярэдняя шчыльн. 22,6 чал. на 1 *км²*. Гарадскога нас. 14%.

Прамысловасць развіваецца на мясцовай сыравіне. Прадпрыемствы: хлебакамбінат, маслазавод, камбінат быт. абслугоўвання, 2 раённыя аб'яднанні Сельгастэхнікі (Докшыцы), торфабрыкетны з-д «Віцебскі» і камбінат буд. матэрыялаў (Крулеўшчына), цагельны з-д «Варганы», прамкамбінат (сталяр-




ныя вырабы), участкі Полацкага хімлясгаса і Плешчаніцкага леспрамгаса, лясгас (Бягомль), 2 спіртзаводы (у саўгасах «Сітцы» і «Бягомльскі»). У раёне 19 калгасаў і 8 саўгасаў (1971).

Калгасы і іх цэнтры: імя Гагарына *(Несцераўшчына)*, імя Гастэлы *(Пугачова)*, «XIX парта'езд» *(Загацце)*, імя Жданава *(Бярозаўка)*, «Зара камунізма» *(Таргуны)*, імя Заслонава *(Докшыцы)*, «Іскра» *(Прудзішкі)*, «Камайскі» *(Камайск)*, «Камсамолец» *(Барсукі)*, імя Я. Коласа *(Крыпулі)*, «Ленінскі шлях» *(Замасточча)*, імя К. Маркса *(Станіслаўцы)*, «Памяць Ільіча» *(Валкалата)*, «Прагрэс» *(Юркаўшчына)*, «Праўда» *(Тумілавічы)*, «Савецкая Беларусь» *(Яблонцы)*, імя Суворава *(Янкі)*, «Усход» *(Паўночнае Гняздзілава)*, «Чырвоны сцяг» *(Парафʼянава)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Бягомльскі» *(Бягомль)*, «Вітунічы» *(Вітунічы)*, «Докшыцкі» *(Янушэва)*, «Камунар» *(Глінная)*, «Порплішча» *(Порплішча)*, «Сітцы» *(Сітцы)*, імя Чарнышэва *(Бярозкі)*, «Чырвонабярэзінскі» *(Бераэіно)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве; вырошчваюць збожжа і бульбу. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 38% тэр. На нач. 1971 асушана 18,7 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 48,8, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 19,7, бульбаю 8,8, тэхнічнымі 2,6, кармавымі культурамі 17,3. На нач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 43,3 (у т. л. кароў 21,5), свіней 35,9, авечак і коз 7,5. На тэр. раёна праходзяць чыгункі Полацк —

Ферма ў вёсцы Лісавічы (саўгас «Сітцы»).



Маладзечна, Крулеўшчына — Варапаева; аўтамаб. дарогі Глыбокае — Докшыцы — Бягомль, Лепель — Бягомль — Плешчаніцы, Докшыцы — Вілейка.

На пач. 1971 у раёне было 14 сярэдніх, 26 васьмігадовых, 64 пач. школы, школа-інтэрнат і дапаможная школа, 2 школы рабочай і сельскай моладзі, 13 дашкольных устаноў, 38 клубных устаноў, 34 масавыя б-кі, 46 кінаўстановак, 10 бальніц, 23 фельч.-ак. пункты. У раёне працуе 458 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 25 інжынераў, 26 аграномаў, 24 вет. ўрачы, 17 заатэхнікаў, 326 настаўнікаў, 37 урачоў і інш.; 854 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Ленінская трыбуна».

С. В. Курач. Мінск.

ДОКШЫЦЫ, горад (з 1940), цэнтр Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. За 200 *км* на З ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Параф'янава. На ўскраіне Д. пачынаецца р. Бярэзіна (прыток Дняпра). 3,9 тыс. ж. (1971).

Вядомы з 15 ст. як мястэчка. У 16 ст. належала роду Кішкаў. У Паўн. вайну 1700—21 спалена (1708). З 1795 у складзе Рас. імперыі, спачатку горад, цэнтр павета Мінскага намесніцтва, пазней мяст. Барысаўскага пав. Мінскай губ. У 1796 зацверджаны герб Д. Паводле перапісу 1897 у Д. 3642 ж., з іх 40,6% пісьменных. Сав. ўлада ўстаноўлена 26.10.1917. Паводле Рыжскага мірнага дагавору 1921 у складзе бурж. Польшчы. У вер. 1939



Докшыцы. Плошча імя І. С. Палявога.

вызвалены Чырв. Арміяй. З 1940 цэнтр раёна Вілейскай вобл., з 1944 Полацкай, з 1954 Маладзечанскай, з 1965 Віцебскай. У Айч. вайну разбураны ням.-фаш. захопнікамі. 3.7.1944 вызвалены Сав. Арміяй.

Прадпрыемствы: хлебакамбінат, маслазавод, 2 раённыя аб'яднанні Сельгастэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, школа рабочай моладзі, муз. школа, дзіцячы сад і яслі, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. Помнік У. І. Леніну. 2 помнікі: сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну, і ахвярам фашызму.

ДОЛАР (англ. dollar ад ням. Taler талер), назва грашовых адзінак (у ЗША, Канадзе і інш. краінах).

1) Долар ЗША. Уведзены з 1786 паводле рашэння кангрэсу ЗША (спачатку сярэбраны, з 1792 і залаты). З 1873 пасля адмены свабоднай чаканкі серабра грашовай адзінкай стаў Д. залаты. Залатая вартасць Д. ў 1900 зафіксавана ў 1,50463 *г*. З 1934 яна знізілася да 0,888671 *г*, а залатыя манеты зняты з абарачэння і заменены банкнотамі. 1 Д. = 0,90 руб. (на 3.8.1971). З'яўляецца таксама грашовай адзінкай Віргінскіх, Каралінскіх, Маршалавых і Марыянскіх а-воў, в-ва Гуам, Самоа Усходняга. Асн.

валюта краін *доларавай зоны*. У сувязі з вострым дэфіцытам плацежнага балансу і інфлянцыяй, выкліканых агрэсіўнай палітыкай урада ЗША, пакупная здольнасць долара падае. ЗША штучна падтрымліваюць яго завышаны парытэт. 2) Д. аўстралійскі, грашовая адзінка Аўстраліі. 1 Д. а.=1,01 руб. (на 3.8.1971). Ляжыць таксама ў аснове грашовай сістэмы а-воў Гілберта і Эліс, в-ва Норфалка, Науру, Новай Гвінеі, Папуа, Саламонавых а-воў. 3) Д. канадскі, грашовая адзінка Канады. 1 Д. к.=0,8858 руб. (на 3.8.1971). 4) Д. малайзійскі, грашовая адзінка Малайзіі. 1 Д. м. =0,294 руб. (на 3.8.1971). 5) Д. новазеландскі, грашовая адзінка Новай Зеландыі, а таксама а-воў Кука, Ніуэ, Такелаў. 1 Д. н.=1,01 руб. (на 3.8.1971). 6) Д. сінгапурскі, грашовая адзінка Сінгапура. 1 Д. с.=0,294 руб. (на 3.8.1971). 7) Д. эфіопскі, грашовая адзінка Эфіопіі. 1 Д. э.=0,36 руб. (на 3.8.1971).

Д. з'яўляецца таксама грашовай адзінкай Багамскіх а-воў (Д. багамскі); Брунеі (Д. брунейскі); Гаяны (Д. гаянскі); Ліберыі (Д. ліберыйскі); Трынідада і Табага (Д. трынідада і табага); Барбадаса, Навятраных і Падвятраных а-воў (Д. усходнекарыбскі); Фіджы (Д. фіджы); Ямайкі і Кайманавых а-воў (Д. ямайскі).

Літ.: Валюты стран мира. Справочник, М., 1970.

ДОЛАРАВАЯ ЗОНА, валютная групоўка капіталіст. краін, якія ў выніку паліт. і эканам. залежнасці ад амер. манаполій праводзяць у міжнародных валютна-фінансавых адносінах узгодненую і выгадную для ЗША палітыку. *Грашовыя сістэмы* і знешнія разлікі краін Д. з. арыентуюцца на валюту-гегемон — долар ЗША (гл. *Долар*).

У Д. з. ўваходзяць: ЗША (з яе калан. ўладаннямі), Балівія, Венесуэла, Гаіці, Гватэмала, Гандурас, Дамініканская Рэспубліка, Канада, Калумбія, Коста-Рыка, Ліберыя, Мексіка, Нікарагуа, Панама, Сальвадор, Філіпіны, Эквадор (1971). Асн. прынцыпы функцыянавання групоўкі: 1) падтрымание нязменных суадносін паміж валютамі краін зоны і долерам ЗША; 2) адсутнасць валютнага кантролю пры міжнар. разліках з замежнымі дзяржавамі; 3) канцэнтрацыя валютных рэзерваў у банках ЗША, якія ажыццяўляюць міжнар. разлікі краін зоны. Панаванне амер. капіталу ў краінах — удзельніцах Д. з. забяспечвае манаполіям ЗША першачарговы доступ да крыніц сыравіны і рынкаў збыту ў гэтых краінах, атрыманне велізарных прыбыткаў. *М. В. Верабей.* Мінск.

ДОЛЕЎ Іван Гаўрылавіч (г. н. і см. невяд.), беларускі дойлід 17 ст. Ураджэнец Полацка. З мяшчан. Кіраваў адной з арцеляў будаўнікоў, якая адпаўляла крапасныя збудаванні ў Полацку. У 1655 у Верхнім замку паставіў чатырох'ярусную шатровую Красную вежу на месцы разбуранай Каралеўскай.

ДОЛІНА Марыя Іванаўна (н. 18.12.1920, в. Шараўка Омскага пав. Акмолінскай вобл.), удзельніца баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941, лётчыца. Зрабіла 78 баявых вылетаў. У час Беларускай аперацыі ўдзельнічала ў баях за Віцебск, Оршу. 28.6.1944 нанесла бомбавы ўдар каля Зембіна, што памагло сав. войскам фарсіраваць Бярэзіну і вызваліць Барысаў. Жыве ў Рызе.

ДОЛЬДЗЕВА, вёска ў Ульянавіцкім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны партызан». За 17 *км* на З ад Сянна, 117 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Вятны, каля шашы Сянно — Чашнікі (2 *км*). 107 ж., гасп. 41 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 45 мірных жыхароў, якім на брацкай магіле пастаўлены помнік.

ДОЛЬНІКАЎ Рыгор Усцінавіч (н. 8.5.1921, в. Сахараўка Горацкага пав. Гомельскай губ.), засл. ваен. лётчык СССР (1965), ген.-маёр авіяцыі (1962). З сялян. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Ваен.-паветр. акадэмію (1955). У 1938—40 слесар з-да імя Мяснікова ў Мінску. У Айч. вайну з чэрв. 1943 на Паўд. фронце, з снеж. 1943 у партыз. атрадзе «За Савецкую Радзіму» ў Адэскай вобл., з сак. 1944 на 2, 4 і 1-м Укр. франтах. Удзельнік абароны Каўказа, вызвалення Польшчы, Чэхаславакіі. Зрабіў больш за 160 баявых вылетаў. Узнач. 3 ордэнамі, медалямі. Служыць у Сав. Арміі.



ДОЛЬНІКІ, у Ст. Русі і ў Вял. княстве Літоўскім да 16 ст. катэгорыя сялян, якія плацілі феадалу-землеўладальніку за арэнду зямлі долю ўраджаю (пазней наз. здольнікі). Долю вызначаў памешчык, яна часам даходзіла да 50—75%. З выплатай землеўладальніку паловы ўраджаю звязана паходжанне тэрміну палоўнікі. Здольшчына — адзін з спосабаў закабалення сялян.


Літ.: Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1959, с. 138—139, 191—193; Греков Б. Д. Крестьяне на Руси с древнейших времен до XVII века, кн. 1—2, 2 изд., М., 1952—54.

ДОЛЯ, 1) падатак з сялян на карысць феадала-землеўладальніка, які забіраў кожны чацвёрты сноп збожжа. У 16—18 ст. пашыраны на Бел. Падзвінні. У канцы 18 ст. Д. заменена чыншам ці паншчынай. 2) Мера вагі да ўвядзення метрычнай сістэмы мер. Д.= =$^1/_{96}$ залатніка=0,0444 *г*.

ДОМ АДПАЧЫНКУ, прафілактычная аздараўленчая ўстанова для адпачынку і аднаўлення сіл працоўных у найбольш спрыяльных і здаровых умовах. Д. а. ствараюць прафесійныя саюзы, мін-вы, ведамствы, асобныя прадпрыемствы і калгасы.

Бываюць круглагадавыя, сезонныя і спецыяльныя (для цяжарных, бацькоў з дзецьмі, падлеткаў і інш.). Першыя Д. а. ў БССР «Ждановічы» (з 1970 санаторый) пад Мінскам, «Чонкі» пад Гомелем, створаны паводле дэкрэту СНК СССР «Аб дамах адпачынку» ад 13.5.1921. У БССР (1970) было 13 Д. а. на 4063 месцы: «Беларусь» (520), «Нарач» (710), «Сож» (440), «Лясныя азёры» (225), «Пухавічы» (275), «Зялёны гай» (150), «Чонкі» (700), «Орша» (355), «Рось» (370), «Звязда» (135), Д. а. тэатр. т-ва (73), Д. а. саюза пісьменнікаў (50), «Рэчанька» (60) і пансіянат (з 1970) «Свіцязь» (155 месцаў). У іх адпачывае штогод каля 90 тыс. працоўных. На ўтрыманне іх выдаткавана (1969) больш за 2,8 млн. руб. 10% пуцёвак у Д. а. выдаецца бясплатна, астатнія за 30% іх намінальнага кошту.

Дом адпачынку «Беларусь».



Літ.: Развитие санаторно-курортного дела в Белорусской ССР, Мн., 1952; Здравницы профсоюзов Белорусской ССР. [Альбом], Мн., 1968; Шалькевич Б. В. 50 лет ленинскому декрету о курортах, «Здравоохранение Белоруссии», 1969, № 5.

Дз. П. Бялуцкі. Мінск.

ДОМ МАДЭЛЯЎ, установа для распрацоўкі мадэляў адзення, абутку, галаўных убораў.

Забяспечвае прадпрыемствы лёгкай прамысловасці тэхн. дакументацыяй, прапагандуе новыя мадэлі і фасоны. У БССР працуе ў Мінску (з 1948), падпарадкоўваецца Мін-ву лёгкай прамысловасці рэспублікі. Яго мадэлі дэманстраваліся на Лейпцыгскім міжнар. кірмашы (1967), Першым Маскоўскім міжнар. фестывалі мод (1967), Міжнар. выстаўках «Адзенне-67» і «Абутак-69» у Маскве, Міжнар. прамысл.-гандл. кірмашы ў Плоўдзіве (1968), Сусп. выстаўцы «Экспо-70» у Японіі.

ДОМ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ (ДНТ), у СССР творча-метадычны цэнтр для дапамогі калектывам мастацкай самадзейнасці. Узніклі ў 1936. На Беларусі створаны абласныя ДНТ у Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве, Мінску і *Рэспубліканскі дом народнай творчасці БССР* у Мінску. Падпарадкоўваюцца Мін-ву культуры БССР і ўпраўленнямі культуры аблвыканкомаў. Выпускаюць рэпертуарныя зборнікі і метадычныя дапаможнікі, арганізоўваюць агляды, фестывалі, конкурсы, дэкады маст. самадзейнасці, канферэнцыі, курсы, семінары па павышэнні кваліфікацыі кіраўнікоў самадзейнасці і рэжысёраў нар. т-раў, выстаўкі прыкладнога і выяўленчага мастацтва. Працуюць у цеснай сувязі з творчымі саюзамі пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, тэатр. аб'яднаннем.

«ДОМ САЛАМОНАВА», адзін з найб. даўніх тэатральных будынкаў на Беларусі. Упершыню ўпамінаецца ў 1796. Стаяў на Саборнай пл. (пл. Свабоды) у Мінску. Належаў сям'і купцоў Саламонавых, якія здавалі яго тэатр. антрэпрызам. У памяшканні «Д. С.» гастралявалі вядомыя польск., рус. і бел. акцёры: М. Кажынскі, К. Скібінскі, Ш. Жукоўскі, Ян Хелмікоўскі, В. Драздоўскі, К. Марцінкевіч і інш. Пасля пажару 1835 т-р перабудаваны ў трох'ярусны і аснашчаны дэкарацыямі з плешчаніцкага т-ра Тышкевічаў. Працаваў у 1837—40, 1855—64. З 1865 выкарыстоўваўся пераважна для канцэртаў. Пасля пажару 1884 рэканструяваны, у 1885 перададзены «Ваеннаму клубу».

Г. І. Барышаў. Мінск.

ДОМАБУДАЎНІЧЫ КАМБІНАТ, высокамеханізаванае прадпрыемства будаўнічай індустрыі, якое спалучае ў бесперапынны тэхнал. паток вытворчасць зборных буд. канструкцый і дэталяў, іх дастаўку на буд. пляцоўку, буд.-мантажныя і аддзелачныя работы; форма арг-цыі буйнапанельнага жыллёвага буд-ва. Аб'ядноўвае: вытворчыя цэхі, мантажныя, спецыялізаваныя і транспартныя ўчасткі, праектна-канструктарскае бюро. Скарачае тэрміны буд-ва, зніжае яго кошт, патрабуе менш абарачальных сродкаў, паскарае іх абарачальнасць. Канчатковая прадукцыя — гатовыя да засялення жылыя дамы. Першы Д. к. у БССР створаны ў Мінску (1960). У 1970 у рэспубліцы было 8 Д. к.: у Мінску — 3, у Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне, Светлагорску. Агульная магутнасць 720 тыс. $м^2$ жыл. пл. ў год (каля 85% усіх дзейных магутнасцей буйнапанельнага буд-ва). Падпарадкоўваюцца Мін-ву прамысл. буд-ва БССР. Мінскі Д. к. № 3 выпускае аб'ёмныя блокі для буд-ва бескаркасных аб'ёмнаблочных будынкаў. Гл. *Аб'ёмнаблочнае будаўніцтва, Аб'ёмны блок.*


Літ.: Гирский В. А., Голубев А. В. и Штейнберг А. С. Заводское производство крупнопанельных домов (заводы и домостроительные комбинаты), М., 1967; Стржалковский Е. Г. Домостроительные комбинаты — новый метод организации строительства, Л.— М., 1960; Атаев С. С. и Блещик Н. П. Технология и экономика объемноблочного домостроения, Мн., 1967.

А. В. Бразойскі. Мінск.

ДОМАКІРАЎНІЦТВА, орган кіравання жыллёвай гаспадаркай мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных і ведамстваў.

Гаспадарча-раяліковая арг-цыя, мае правы юрыд. асобы. Асн. функцыі: трымае жылы фонд у адпаведным тэхн. стане, рамантуе, добраўпарадкоўвае дамы і дваровую тэрыторыю, удзельнічае ў прыёме новых і адрамантаваных жылых дамоў. У найб. буйных Д. працуюць педагогі-арганізатары, якія вядуць выхаваўчую і фізкультурна-масавую работу з дзецьмі і падлеткамі. Усю дзейнасць Д. ажыццяўляюць з грамадскімі арг-цыямі і дамавымі камітэтамі. Узначальвае Д. домакіраўнік.

ДОМБАЛЬ Тамаш Францавіч (29.12.1890, в. Собаў Тарнабжэскага пав., Галіцыя — 4.12. 1938), беларускі сав. вучоны, дзеяч міжнар. сялянскага руху. Акад. АН БССР (1933), д-р эканам. н. (1934), праф. (1932). З сялян. Чл. КПСС з 1920. Вучыўся ў Венскім і Кракаўскім ун-тах (1909—18), скончыў Ін-т чырв. прафесуры і с.-г. акадэмію ў Маскве (1927). З ліст. 1918 на радзіме, арганізатар і кіраўнік рэвалюц. сялянскага руху ў Галіцыі, старшыня рэўкома Тарнабжэскай сав. сялянскай рэспублікі.




Пасля разгрому паўстання арыштаваны, уцёк і вёў нелегальна рэвалюц. работу. З 1919 дэпутат польскага сейма, выступаў за бясплатную перадачу памешчыцкіх зямель сялянам, супраць польска-сав. вайны. У ліп. 1921 з С. Ланцуцкім стварыў у сейме камуніст. фракцыю. У снеж. 1921 пазбаўлены дэпутацкай недатыкальнасці, арыштаваны і засуджаны на 6 гадоў катаргі. У сак. 1923 вызвалены ў выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР. Ініцыятар склікання 1-й міжнар. сялянскай канферэнцыі ў Маскве (10—16.10.1923), якая заснавала Ся-

лянскі Інтэрнацыянал, а Д. быў выбраны нам. ген. сакратара Выканкома. Працаваў у Выканкоме Камінтэрна, МОПРы, супрацоўнічаў у час. «Крестьянский Интернационал», заснаваў навук.-даследчы Міжнар. агр. ін-т (1926), займаўся навук. працай. У 1932—35 віцэ-прэзідэнт АН БССР і дырэктар Ін-та эканомікі АН БССР. Чл. ЦК КП(б)Б (1932—37), чл. ЦВК БССР (1935—37). Аўтар прац па міжнар. сялянскім руху і эканоміцы с. гасп.

Тв.: Ленин и крестьяне, «Крестьянский Интернационал», 1924, № 1; Крестьянский Интернационал, там жа; Борьба за крестьянство в Польше, там жа, 1925, № 1—2; Задачи и достижения Крестинтерна, там жа, 1925, № 3—5; Заметки о крестьянском движении в Европе, «Коммунистический Интернационал», 1927, № 5 (пад псеўд. Т. Ордан); Кароткі нарыс развіцця народнай гаспадаркі БССР, у кн.: Усе раёны БССР, Мн., 1933; Праблема «Вялікага Дняпра», «Запіскі Беларускай Акадэміі Навук», 1934, кн. 2; (разам з У. М. Пілько) Звышранняя слуба, Мн., 1934. *А. В. Вараб'ёў.* Мінск.

ДОМЕННАЯ ПЕЧ (домна), шахтавая печ для выплаўкі *чыгуну* (радзей — ферасплаваў). Выплаўка чыгуну адбываецца пры сустрэчным руху і ўзаемадзеянні патоку плавільных матэрыялаў, т. зв. шыхты (зверху ўніз), з патокам газаў, якія ўтвараюцца пры згаранні паліва (знізу ўверх). Працуе Д. п. да 5—10 гадоў і больш, да замены футэроўкі. Асн. паказчыкам магутнасці Д. п. з'яўляецца «карысны» аб'ём, які дасягае 3000 $м^3$ (1971). За суткі Д. п. выпускае каля 5000 *т* чыгуну.



Унутраная прастора Д. п. (гл. рыс.) складаецца з горна (*13*), заплечыкаў (*10*), распара (*4*), шахты (*5*) і калашніка (*6*). Верхняя частка печы выкладзена вогнетрывалай шамотнай цэглай, ніжняя — вугальнымі блокамі. На шахту надзеты сталёвы кажух (*9*), які ахалоджваецца пераважна вадою. На верхнім поясе горна размешчаны фурмы (*2*), рукавы (*3*) і кольцавыя трубы (*11*), праз якія ў Д. п. нагнятаецца паветра; ніжэй знаходзяцца ляткі, праз якія выпускаюць шлак (*12*), на ўзроўні дна (пода) горна (*14*) — ляток для выпускання вадкага чыгуну (*1*). У верхняй частцы Д. п. засыпны апарат (*7*) і газаадводы (*8*). Шыхта (афлюсаваны агламерат і кокс) загружаецца ў Д. п. засыпным апаратам, пры гэтым чаргуюцца слаі агламерату і коксу. Флюсы (звычайны ці даламітавы вапняк) патрэбны для ўтварэння вадкага шлаку з пустой пароды і попелу і рэгулявання яго саставу. У ніжнюю частку Д. п. праз фурмы нагнятаецца гарачае (1000—1200 °С) паветра з кіслародам і прыродны газ. Ад няпоўнага згарання паліва (гарэнне адбываецца ў слоі вял. таўшчыні) утвараецца, апрача інш. газаў, вокіс вугляроду, які разам з вугляродам «аднаўляе» жалеза з яго вокіслаў. Пры згаранні паліва шыхта паступова апускаецца ў ніжнюю частку шахты, дзе яна плавіцца. Пры т-ры каля 1140 °С утвараюцца вадкі чыгун (жалеза, у якім каля 4,3% вугляроду) і шлак. Калі вадкі шлак праходзіць у межы больш высокіх т-р (у горан), у ім растворваюцца ўся пустая парода і флюс, а пасля згарання коксу — і попел. З горна чыгун перыядычна выпускаецца праз чыгунныя ляткі (5—8 разоў за суткі), шлак — праз шлакавыя ляткі (да 20 разоў за суткі). Т-ра вадкага чыгуну пры выпуску 1300—1450 °С, шлаку — на 40—80 °С вышэйшая. Доменны газ, які ўтвараецца пры доменным працэсе, выходзіць з Д. п. праз газаадводы; выкарыстоўваецца для апалу паветранагравальнікаў (каўпераў), кательняў. Шлак грануляцыя; выкарыстоўваецца ў буд-ве. Д. п. абсталёўваюцца скіпавымі падымальнікамі з ваганеткамі ці канвеерамі, якія праз 5—10 *мін* падаюць на калашнік па чарзе кокс і агламерат. Кожная Д. п. мае 2—4 паветранагравальнікі, ліцейны і рудны дворы. Недалёка ад Д. п. размяшчаецца агламерацыйная фабрыка (гл. *Агламерацыя*).

Літ.: Юрьев Б. Н. и Юрьева Л. В. Методы расчета доменной плавки, Свердловск, 1961; Вагин А. А. Доменное производство, М., 1962; Сорокин Л. А. Работа конструкций доменных печей, М., 1962; Доменное производство. Справочник, под ред. И. П. Бардина, т. 1—2, М., 1963; Баранов Е. М. Краткий справочник доменщика, М., 1965. *У. Р. Хадасевіч.* Мінск.

ДОМЖАРЫЦКАЕ, возера ў бас. р. Сергуч, левага прытока Бярэзіны, у Лепельскім р-не Віцебскай вобл.; на тэр. Бярэзінскага дзярж. запаведніка. Пл. 1,8 $км^2$. Даўж. 2,1 *км*, найб. шыр. 1,6 *км*, сярэдняя 0,86 *км*, найб. глыб. 2,7 *м*, сярэдняя 1,6 *м*. Катлавіна круглявая. Схілы спадзістыя, укрытыя мяшаным лесам і хмызняком. Берагі нізкія, забалочаныя. Дно плоскае, услана ілам (тоўшча 5—6 *м*); глыбіні паступова большаюць да сярэдзіны. Вадазбор (7,5 $км^2$) дробнаўзгорысты і нізінны. Воз. зарастае. У Д. ўпадае ручай, сцёк па пратоцы ў Сергуч. Водзяцца акунь, плотка, лінь, шчупак, джгір.

ДОМЖАРЫЦЫ, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., на беразе Сергуцкага канала. Цэнтр сельсавета. За 35 *км* на ПдЗ ад Лепеля, 150 *км* ад Віцебска. 342 ж., гасп. 115 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

ДОМ-КРЭПАСЦЬ, тып жылога дома. На Беларусі вядомы з 17 ст. Звычайна кампактная пабудова з 4 абарончымі вежамі па вуглах (гл. *Гайцюнішскі дом-крэпасць*). Кампазіцыя Д.-к. склалася пад уплывам замкавай архітэктуры.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП, адкрыты ў Мінску ў 1923 у доме, дзе адбыўся *Першы з'езд РСДРП* (1898). У Вял. Айч. вайну спалены нямец.-фаш. захопнікамі, знішчаны ўсе экспанаты. У 1948 адноўлены.


У фондах і 6 экспазіцыйных залах (пл. 127 $м^2$) больш за 350 экспанатаў. Аддзелы: тэматычны — дэманструюцца матэрыялы пра нашырэнне марксізма ў Расіі, дзейнасць У. І. Леніна па стварэнні марксісцкай партыі; мемарыяльны — пакоі, дзе праходзілі пасяджэнні з'езду.

Сярод экспанатаў дакументы і матэрыялы пра ўзнікненне і дзейнасць першых марксісцкіх гурткоў у Расіі, групы «Вызваленне працы», Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа», пра барацьбу Леніна супраць народнікаў, легальных марксістаў, «эканамістаў»; фотаздымкі дэлегатаў І з'езду; карта-схема с.-д. арг-цый, якія мелі прадстаўнікоў на з'ездзе; рашэнні з'езду, «Маніфест Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі» (выд. 1898) і нумары ленінскай «Искры»; першыя выданні твораў Леніна «Тлумачэнне закону аб штрафах, якія спаганяюцца з рабочых на фабрыках і заводах», «Што рабіць?» і інш.; жандарскія і паліцэйскія данясенні пра І з'езд РСДРП. У мемарыяльных пакоях у 1954 адноўлена абсталяванне кватэры П. В. Румянцава, якім яно было ў час з'езду, у т. л. сапраўдныя рэчы, якія належалі сям'і Румянцава (альбом з сямейнымі фотаздымкамі, гадзіннік з зязюляй, падсвечнікі, гатавальня і інш.). У музеі праводзяць злёты камсамольцы і піянеры, уручаюць камсамольскія білеты, адбываюцца заняткі гурткоў палітасветы, школы маладых камуністаў, сустрэчы з ветэранамі партыі. Музей наведалі дзесяткі міжнар. камуніст. і рабочага руху В. Ульбрыхт, Т. Жыўкаў, М. Тарэз, Я. Кадар, Ю. Цэдэнбал, Хо Шы Мін і інш. У 1970 музей наведала больш за 177 тыс. чал. (ін. гл. на ўклейцы).

Літ.: Миронова Ж. и Магидова А. Доммузей I съезда РСДРП, Мн., 1970.
Ж. М. Міронава. Мінск.

ДОМНІКІ, вёска ў Гарадскім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл., каля р. Сосніца (1 *км*). Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 33 *км* на У ад Полацка, 102 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Гараны. 130 ж., дварoў 54 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка; фельч.-ак. пункт, магазін. Ням.-фаш. акупанты спалілі вёску, загубілі 58 жыхароў. Брацкая магіла 247 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДОМРА, рускі народны струнны шчыпковы музычны інструмент; корпус грушападобны, 3 струны, іграюць плектрам (пласцінкаю). Ужывалася скамарохамі, якія стварылі сям'ю Д. (домрышка, домра, домра басістая). Паступова знікла ў 2-й пал. 18 ст. У 90-я г. 19 ст. рэканструявана па ініцыятыве В. Андрэева. У 1908 Р. Любімавым і С. Буравым створана 4-струнная Д. Абедзве разнавіднасці выкарыстоўваюцца ў аркестрах рус. нар. інструментаў. Секстэт Д. працуе на Бел. тэлебачанні і радыё.



ДОН (стараж.-грэч. Танаїс), рака ў Еўраз. частцы СССР. Даўж. 1870 *км*. Пл. бас. 422 тыс. $км^2$. Пачынаецца на ўсх. схілах Сярэднерускага ўзв. на выш. 190 *м*. Упадае ў Таганрогскі зал. Азоўскага м.

У верхняй ч. (да ўпадзення Сасны) даліна вузкая, рачышча звілістае са шматлікімі перакатамі: правы бераг высокі, левы спадзісты. У сярэдняй ч. (да г. Калач-на-Дону) даліна расшыраецца, пойма шырокая, левы бераг пясчаны. У нізоўі Цымлянскае вадасх. (пл. 2700 $км^2$, аб'ём вады 23,9 $км^3$), ГЭС (160 тыс. *кВт*), *Волга-Данскі судаходны канал* імя У. І. Леніна, які злучае Д. з Волгай. Ад Растова-на-Дону пачынаецца дэльта (пл. да 340 $км^2$). Асн. прытокі: левыя — Варонеж, Віцюг, Хапёр, Мядзведзіца, Сал, Маныч; правыя — Красівая Меча, Сасна, Чыр, Северскі Данец. Жывленне пераважна снегавое. Ледастаў з ліст. да крас. У вярхоўі і з снеж. да сак. ў нізоўі. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 930 $м^3/сек$.

Суднаходны ад вусця да г. Георгіу-Дэж, на працягу 1355 *км*. Асн. прамысл. рыбы: судак, лешч, сазан, чахонь, данскі селядзец, асетр, сяўруга. Найбольшыя гарады: Лебядзянь, Задонск, Георгіу-Дэж, Паўлаўск, Калач-на-Дону, Растоў-на-Дону.

ДОНАР (лац. dono даю, дару), чалавек, які добраахвотна дае сваю кроў для пераліванння

яе хворым або для атрымання *гама-глабуліну*, сывараткі супраць адру, інш. прэпаратаў. Здаровым людзям донарства не шкодзіць.

Літ.: Гл. пры арт. *Пераліванне крыві.*

ДОНАРНА-АКЦЭПТАРНАЯ СУВЯЗЬ, гл. *Хімічная сувязь.*

ДОНГ, грашовая адзінка Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам (з 1946). 1 Д.=10 хаа=100 су. Паводле афіц. курсу Дзяржбанка СССР на 3.8.1971 100 Д.=30,60 руб.

ДОПІЧ Аляксандру (1806, в. Безін, Бесарабія — 1866), малдаўскі і румынскі паэт, стваральнік нац. малд. байкі. З сям'і памешчыка. Вучыўся ў кадэцкім корпусе ў Пецярбурзе, быў блізкі да дзекабрыстаў. З 1835 жыў у Малдавіі. Аўтар зб. баек «Фабуле» (кн. 1—2, 1840—42). Байкі поўныя дэмакратызму і сац. пратэсту («Арлы і павукі», «Лісты і карані», «Леў на паляванні», «Два сабакі» і інш.). Перакладаў на малд. мову творы А. Пушкіна («Цыганы», 1837), А. Кантэміра.

ДОПІНГ (англ. dope даваць наркотык), 1) узбуджальныя сродкі, якія даюць коням перад скачкамі, каб штучна павялічыць іх жвавасць. 2) Д. (у шырокім сэнсе) — узбуджальныя сродкі (раслінныя алкалоіды ці хім. прэпараты і інш.), якія часова аслабляюць пачуццё стомленасці і павялічваюць працаздольнасць спартсменаў. Д. разбуральна дзейнічае на арганізм і пераўзбуджае нервовую сістэму. Ужываецца ў прафес. спорце. З 1967 на міжнар. спаборніцтвах вядуцца мед. абследаванні спартсменаў, каб не дапусціць ужывання Д. У сав. спорце забаронены.

ДОПЛЕРА З'ЯВА (Доплера эфект), змена частаты ваганняў хваляў, якая назіраецца пры адносным руху назіральніка і крыніцы хваляў. Адкрыта ў 1842 аўстр. фізікам Х. Доплерам і незалежна ад яго ў 1848 франц. фізікам І. Фізо.

Калі ν_0 — частата крыніцы ваганняў, ν — частата, якую ўспрымае назіральнік, то пры збліжэнні назіральніка і крыніцы хваляў $\nu > \nu_0$, а пры аддаленні — $\nu < \nu_0$. Налічаюць Д. з. для святла даказана экспериментальна А. А. *Белапольскім* у 1900. Для эл.-магн. хваляў Д. з. вынікае з *адноснасці тэорыі*. Д. з. карыстаюцца ў радыёлакацыі, гідралакацыі і пры вызначэнні скорасці руху зорак і інш. астр. аб'ектаў.

ДОПУСК (у машынабудаванні), найбольшае дапушчальнае адхіленне памеру дэталі ад яго намінальнага значэння.

Велічыня Д. (поле Д.) вызначаецца розніцаю паміж гранічнымі памерамі дэталі ці розніцаю паміж гранічнымі адхіленнямі ад намінальнага памеру дэталі. Адрозніваюць плюсавы (розніцаь паміж верхняй граніцай поля Д. і нулявой лініяй) і мінусавы Д. (розніцаь паміж нізкняй граніцай поля Д. і нулявой лініяй). Д. на памеры дэталяў неабходны таму, што абс. дакладнасці пры вырабе дэталяў дасягнуць немагчыма. Велічыня Д. павінна быць такая, каб пры злучэнні дэталі маглі рухацца адна адносна другой ці быць нерухомыя (рухомыя, нерухомыя і пераходныя пасадкі). Д. вызначаецца патрабаваннямі ўзаемазамяняльнасці ці ўмовамі наступнай апрацоўкі дэталі (аперацыйны Д.). У сістэме ДАСТаў Д. рэгламентаваны класамі дакладнасці; дыяпазону ад 1 да 500 *мм* вызначана 10 класаў дакладнасці.

Літ.: Гл. пры арт. *Пасадка.*
М. Л. Праменка. Мінск.

ДОРАХАЎ Іван Сямёнавіч (1762—26.4.1815), герой Айч. вайны 1812, ген.-л. (1812). Удзельнік рус.-тур. вайны 1787—91. З 1803 шэф

Ізюмскага гусарскага палка, з якім удзельнічаў у вайне 1806—07 супраць Францыі. У Барадзінскай бітве 1812 камандаваў кав. брыгадай. З верасня камандзір партыз. атрада. Вызваліў г. Вераю, які стаў апорным пунктам партыз. атрадаў.

Літ.: Жерве Н. Славные партизаны 1812 года, М.— СПб., 1912; Колюбакин В. Набег Дорохова на Смоленскую (Можайскую) дорогу, «Военный сборник», 1900, № 2. *Я. І. Карнейчык.* Мінск.

ДОРГІШКІ, вёска ў Гальшанскім с/с Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Клява. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 26 *км* на Пд ад Ашмян, 194 *км* ад Гродна, 18 *км* ад чыг. ст. Багданаў, на аўтамаб. дарозе Ашмяны — Ліда. 181 ж., дварoў 52 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 25 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДОРН (ням. Dorn), 1) вал з прыстасаваннем для трымання загатоўкі; ужываецца пры апрацоўцы вонкавай паверхні дэталяў з цэнтр. адтулінай (трубаў, утулак). 2) Парожні ці суцэльны метал. асяродак, на якім збіраюць і вулканізуюць гумавыя вырабы. 3) Стрыжань з загартаванай сталі, якім робяць дарнаванне. 4) Д. ратацыйны — інструмент для ратацыйнага дарнавання (гл. *Дарнаванне*).

ДОРСКІ Іосіф Львовіч [4(17).12.1911, Мінск — 7.12.1964], бел. сав. тэатральны дзеяч і драматург. Засл. дз. маст. БССР (1961). Чл. КПСС з 1945. У Мінску скончыў курсы кінасцэнарыстаў (1930). Працаваў на кінафабрыцы «Савецкая Беларусь» у Ленінградзе (1931—33). У 1935—48 заг. літ. часткі БДТ-2 (т-р імя Я. Коласа), пасля дырэктар гэтага тэатра. Літ. дзейнасць пачаў у 1930. З К. Губарэвічам напісаў драму пра Айч. вайну «Цэнтральны ход» (паст. т-рам імя Я. Коласа, 1948) і лірычную камедыю «Алазанская даліна» (1951, паст. т-рам імя Я. Коласа ў 1949) пра мірную працу бел. калгаснікаў у першыя пасляваен. гады. Аўтар п'есы «Права на шчасце» (паст. т-рам імя Я. Коласа, 1956). Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ДОРТМУНД (Dortmund), горад у ФРГ, у складзе зямлі Паўн. Рэйн — Вестфалія. Упершыню ўпамінаецца ў 885 пад назвай Тратманія. Порт на р. Эмшэр каля пачатку канала Д.— Эмс, транспартны вузел. 646 тыс. ж. (1968). Вялікі індустр. цэнтр Рура. Каменнавугальная, металург. (чыгуналіцейныя, сталеліцейныя і сталеплавільныя прадпрыемствы), маш.-буд. (с.-г. і дарожныя машыны, вагоны), хім., нафтаперапрацоўчая прамысловасць, станкабудаванне. Ваен. вытворчасць. Вышэйшая горная школа.

ДОРЫ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны сцяг». За 20 *км* на У ад Валожына, 60 *км* ад Мінска, 23 *км* ад чыг. ст. Аляхновічы. 432 ж., гасп. 124 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. 23.7.1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 257 мірных жыхароў. Помнікі на дзвюх брацкіх магілах: 4 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну, 257 ахвяр фашызму.

ДОСЛЕД (эксперымент), спосаб вывучэння з'яў аб'ектыўнага свету ў спецыяльна створаных, дакладна вызначаных умовах, якія забяспечваюць цячэнне працэсу «ў чыстым выглядзе».

Дае магчымасць вывучаць аб'ект цалкам або расчлянёны па частках, параўноўваць стан аб'екта ў разнастайных умовах, паўтараць з'яву да таго часу, пакуль не будзе дасягнута мэта вывучэння. Д.— адна з формаў грамадска-гістар. практыкі, накіраванай на пазнанне і пераўтварэнне свету. Ён дае факты для тэарэт. абагульнення, ужываецца для пацвярджэння тэорый і гіпотэз. Побач з Д. шырока практыкуецца простае назіранне, якое не прадугледжвае актыўнага ўздзеяння на аб'ект, а таксама «мысленны эксперымент» (аперыраванне ідэальнымі вобразамі, пабудова ідэалізаваных мадэляў). З развіццём навукі і тэхнікі межы выкарыстання Д. пашыраюцца, ён робіцца больш складаным. Вял. значэнне набывае сацыяльны Д., які памагае выяўляць і даследаваць заканамернасці развіцця грамадства.


Літ.: Назаров И. Н. Производственный эксперимент и его роль в познании, М., 1962; Сивоконь П. Е. Методологические проблемы естественнонаучного эксперимента, М., 1968; Жданов Г. Б. Эксперимент и теория в современном естествознании (Физические науки), у кн.: Материалистическая диалектика и методы естественных наук, М., 1968. *Л. Р. Крайчанка.* Мінск.

ДОТЫК (тактыльнае адчуванне), успрыманне жывёльнымі арганізмамі і чалавекам комплексу адчуванняў, якія ўзнікаюць пад уплывам раздражняльнікаў вонкавага асяроддзя на рэцэптары дакранання, ціску, холаду, ціпла, болю, руху. Нервовыя канцы, адчувальныя да адпаведных раздражняльнікаў, былі выяўлены ў канцы 19 ст. ў пэўных кропках паверхні скуры, вонкавай часткі слізістай абалонкі, мышачна-сустаўнога апарату і атрымалі назву *рэцэптараў*. Кожная кропка скуры ўспрымае некалькі відаў раздражняльнікаў, але самую высокую адчувальнасць мае на адзін з іх. Найбольш адчувальных кропак на канцах пальцаў рук, языка, на слізістай абалонцы губ.

Ад дзеяння на скуру механічных ці тэмпературных раздражняльнікаў у канцы нерва адбываецца прасторавая змена нейрафібрыл або тэрмаэлектрычны эфект у нейраплазме, на мембране першовага канца выпрацоўваецца патэнцыял узбуджэння. Апошнім кадуецца інфармацыя і перадаецца па нервах праз спінны, прадаўгаваты мозг, зрокавыя бугры ў заднюю цэнтр. звіліну кары галаўнога мозгу. У працэсе эвалюцыі тактыльныя адчуванні (дакрананне, ціск), выконваючы ролю рухальных рэфлексаў, прыйшлі на змену рухальна-ахоўным рэфлексам, якія стымулююцца болем, і тым самым забяспечылі прагрэс пазнавальнай ролі скурнай адчувальнасці. Пры актыўным Д. (абмацванні) аб'ядноўваецца работа скурна-механічнага рухальнага пачуцця, што забяспечвае спецыфічнае чалавеку адбіццё вонкавага асяроддзя і мае вялікае значэнне ў яго прац. дзейнасці. Ад узаемадзеяння рукі чалавека з прыладамі працы паявілася форма актыўнага Д.— апасродкаваны ці інструментальны Д.

Літ.: Физиология человека, М., 1966; Ананьев Б. Г. и др. Осязание в процессах познания и труда, М., 1959 (бібліягр.); Окс С. Основы нейрофизиологии, пер. с англ., М., 1969; Гранит Р. Электрофизиологическое исследование рецепции, пер. с англ., М., 1957. *М. С. Банъ.* Мінск.

ДОЎБАР-МУСНІЦКАГА МЯЦЕЖ 1918, антысавецкае выступленне 1-га польскага корпуса на чале з І. Р. Доўбар-Мусніцкім, сфарміраванага ў ліп. 1917 бурж. Часовым урадам (3 пях. дывізіі, конніца і артылерыя — да 25 тыс. чал.). Часці корпуса размяшчаліся ў Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Курскай і Смаленскай губ., штаб у Мінску, з канца 1917 у Бабруйску. Пасля Кастр. рэвалюцыі ірыгодзе Сав. улады корпус пачаў канцэнтравацца ў раёне Рагачоў — Жлобін — Бабруйск.



Аднак яго камандаванне не выконвала пастановы Сав. ўрада аб дэмакратызацыі арміі, разгарнула шавіністычную прапаганду, падтрымлівала сувязь з польскімі бурж. коламі ў Расіі і за мяжой, якія імкнуліся ўключыць Беларусь у склад Польшчы. 12(25).1.1918 Доўбар-Мусніцкі ўзяў мяцеж і пачаў наступленне на Магілёў і Мінск. Штаб 1-й польскай дывізіі, якая заняла 13 студз. Рагачоў, аб'явіў пра ўключэнне ўсёй Магілёўскай губ. ў склад «польскай дзяржавы», якая яшчэ не існавала. Легіянеры разганялі Саветы, сялянскія к-ты, рабавалі насельніцтва, затрымлівалі эшалоны і разбройвалі салдатаў, парушылі сувязь Рэвалюц. Стаўкі ў Магілёве з франтамі і пагражалі штабу Зах. фронту. Перагаворы з камандаваннем корпуса не прывялі да ўрэгулявання канфлікту. 21 студз. (3 лют.) камандаванне Зах. фронту загадала расфарміраваць і дэмабілізаваць корпус. 22 студз. (4 лют.) Вярх. галоўнакамандуючы М. В. Крыленка аб'явіў Доўбар-Мусніцкага па-за законам. Зняты з фронту латышскія стралкі і атрады рэвалюц. матросаў і Чырв. гвардыі (каля 10 тыс. чал.) пад камандаваннем І. І. Вацэціса 26 студз. пачалі наступаць на Рагачоў, разбілі 1-ю польскую дывізію і ў ноч на 31 студз. (13 лют.) занялі Рагачоў. Яшчэ раней быў вызвалены Жлобін. Пасля цяжкіх баёў у сярэдзіне лютага 2-я дывізія корпуса і рэшткі 1-й адступілі да Бабруйска (у гэты час часці 3-й дывізіі з-пад Рослаўля прабіліся таксама ў Бабруйск). На мінскім напрамку, у раёне ст. Асіповічы і Ясень, баі вялі рэвалюц. войскі 2-й арміі і атрады Чырв. гвардыі. Адначасова бальшавікі і палякі-інтэрнацыяналісты вялі агітацыю ў корпусе, растлумачваючы сутнасць Сав. улады і палітыку камандавання корпуса. Да 18 лют. было дэмабілізавана больш за 3 тыс. салдатаў. Некат. часці перайшлі ў савецкія ваен. і нац.-рэвалюц. фарміраванні (1-ы польскі рэвалюц. дывізіён у Віцебску, польскі батальён 1-га рэвалюц. палка імя Мінскага Савета, 1-ы польскі рэвалюц. полк і інш.). 18 лют. ням. войскі, парушыўшы перамір'е, пачалі наступленне. Скарыстаўшы гэта, мяцежнікі разбілі атрады рэвалюц. войск пад Асіповічамі, а часці корпуса, што знаходзіліся ў раёне Мінска, у ноч на 20 лют. захапілі Мінск. Паводле дагавору з ням. камандаваннем 1-ы польскі корпус астаўся на Беларусі ў якасці акупац. войск. Пад уплывам агіт. дзейнасці бальшавікоў у ім узмацніўся распад, і ў маі 1918 немцы расфарміравалі корпус. У бурж. Польшчы нейкі час існавала арг-цыя ўдзельнікаў мяцяжу — т. зв. «Саюз доўбарыкаў».

Літ.: Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967; Спреслис А. И. Латышские стрелки на страже завоеваний Октября. 1917—1918 гг., Рига, 1967; Федоров А. М. Разгром контрреволюционных очагов Красной гвардией, М., 1940; Хохлов А. Г. Красная гвардия Белоруссии в борьбе за власть Советов, Мн., 1965. *А. В. Вараб'ёў.* Мінск.

ДОЎБАР-МУСНІЦКІ Іосіф Рамуальдавіч (25.10.1867, Гарбаў Сандамірскага пав. Радамскай губ.— 28.10.1937), ген.-л. царскай арміі, арганізатар контррэвалюц. мяцяжу на Беларусі (гл. *Доўбар-Мусніцкага мяцеж 1918*). З дварян. Скончыў акадэмію Ген. штаба (1902). Удзельнік рус.-яп. і 1-й сусв. войнаў. У 1917 пры згодзе Часовага ўрада на Зах. фронце сфарміраваў 1-ы польскі корпус. У канцы 1918 прыняў польскае падданства і камандаваў войскамі ў Польшчы. Да палітыкі Пілсудскага быў у апазіцыі.

А. В. Вараб'ёў. Мінск.

ДОЎБІЗНА, вёска ў Вярховіцкім с/с Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзяржынскага. За 32 *км* на ПнЗ ад Камянца, 71 *км* ад Брэста, 18 *км* ад чыг. ст. Высока-Літоўск. 293 ж., гасп. 88 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 96 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДОЎГАВІЧЫ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Кашанка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ударнік». За 33 *км* на ПдЗ ад Мсціслава, 90 *км* ад Магілёва, 14 *км* ад чыг. ст. Ходасы, на аўтамаб. дарозе, якая злучае Д. з шашою Магілёў — Мсціслаў. 731 ж., гасп. 239 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, дзіцячыя яслі, аддз. сувязі, магазін, швейная майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Помнік 172 воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДОЎГАЕ, возера ў бас. р. Шошы (бас. Дзісны), у Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,19 *км*². Даўж. 6,1 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,36 *км*, найб. глыб. 53,7 *м* (самае глыбокае возера ў БССР), сярэдняя 12 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы высокія, пераважна стромкія (35°—40°), складзены з марэнных суглінкаў. Укрыты лесам і хмызняком. 2 глыбокія плёсы падзелены высокім падняццем дна. Найб. глыбокія ўчасткі дна ўсланы чорнымі іламі, якія вышэй зменьваюцца алiўкавымі; літараль услана

апясчаненым ілам, пяском і гліпаю. Вадазбор (32,6 км²) раўнінны. Сцёк па пратоцы ў воз. Шо. Водзяцца лешч, шчупак, акунь, лінь, плотка, карась, язь, мянтуз.

ДОЎГАЕ, возера ў бас. р. Дрысвяты, левага прытока Дзісны (бас. Зах. Дзвіны), у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,13 км². Даўж. 2,2 км, найб. шыр. 0,8 км, сярэдняя 0,5 км, найб. глыб. 24,1 м, сярэдняя 6,1 м. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы ўмерана стромкія, укрытыя лесам і хмызняком, часткова ворныя. Берагі пераважна стромкія, на Пн і Пд забалочаныя. Два плёсы возера злучаныя вузкім пралівам. Найб. глыбакаводны паўд.-ўсх. плёс. Дно ўслана карычневым і аліўкавым ілам. Ёсць невялікі востраў, зарослы лесам і хмызняком. Вадазбор (834 км²) пераважна сярэднеўзгорысты. Праз возера працякае р. Дрысвята. Водзяцца шчупак, лінь, язь, акунь, карась, мянтуз, судак, сазан; ёсць вугор.

ДОЎГАЕ, возера ў бас. р. Эсы (бас. Зах. Дзвіны), у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,75 км². Даўж. 2,5 км, найб. шыр. 0,5 км, сярэдняя 0,3 км. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы пераважна пад ворывам. Вадазбор (29 км²) паката-хвалісты, складзены з марэны. Д. злучана пратокай з воз. Паўсвіж; сцёк у воз. Задняе. Водзяцца плотка, шчупак, лешч, акунь, джгір.

ДОЎГАЕ, возера ў бас. р. Зехі (бас. Зах. Дзвіны), у Лепельскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,64 км². Даўж. 2,5 км, найб. шыр. 0,3 км, сярэдняя 0,25 км. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор (14,1 км²) паката-хвалісты, складзены з марэны. Сцёк у воз. Пышна. Водзяцца акунь, шчупак, лешч, джгір.

ДОЎГАЕ, возера ў бас. р. Нешчарды, правага прытока Дрысы (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,5 км². Даўж. 2 км, найб. шыр. 0,4 км, сярэдняя 0,25 км. Вадазбор дробнаўзгорысты, паўн. ч. забалочаная. Д. злучана пратокай з воз. Круглае; сцёк у воз. Нешчарда. Водзяцца плотка, акунь, шчупак, лешч, мянтуз, джгір.

ДОЎГАЕ, вёска ў Клічаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Даўжанка. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Доўгаўскі». За 29 км на ПнУ ад Клічава, 66 км ад Магілёва, 11 км ад чыг. ст. Мілае. 601 ж., двароў 196 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, 2 магазіны. 19.2.1943 вёску спалілі нямец.-фаш. захопнікі, загубілі 97 мірных жыхароў.

ДОЎГАЕ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл., каля р. Случ (1 км). Цэнтр сельсавета і калгаса «40 гадоў БССР». За 33 км на Пд ад Салігорска, 166 км ад Мінска. 1083 ж., гасп. 283 (1971). Майстэрні Старобінскага буд.-мантажнага ўпраўлення. Сярэдняя школа, 2 клубы, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 6 магазінаў. На Кургане баявой Славы помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДОЎГАТЭРМІНОВЫ КРЭДЫТ, гл. ў арт. *Крэдыт*.

ДОЎГАЯ, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., на левым беразе Шчары. Цэнтр сельсавета. За 34 км на ПнУ ад Іванцэвіч, 170 км ад Брэста, 14 км ад чыг. ст. Даманава. 447 ж., гасп. 146 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.


ДОЎГІ МОХ, вёска ў Ваўкавіцкім с/с Чавускага р-на Магілёўскай вобл., на р. Раста. Цэнтр калгаса імя Дзяржынскага. За 40 км на ПдЗ ад Чавусаў, 50 км ад Магілёва, 36 км ад чыг. ст. Чавусы. 375 ж., гасп. 140 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДОЎГІРД Анёл (2.12.1776, маёнтак Юркаўшчына Мсціслаўскага пав. Полацкай губ.— 26.4.1835), філосаф, логік і псіхолаг. Праф. філасофіі і логікі Віленскага ун-та (1818—32). Чл. каталіцкага ордэна піяраў. Д. лічыў, што сусвет, адпойчы створаны богам, падпарадкоўваецца натуральным законам. Прадметы і іх уласцівасці існуюць незалежна ад нашай свядомасці, а таму нельга атаясамліваць з імі адчуванні і ўяўленні чалавека. Адмаўляў існаванне прыроджаных ідэй, але прызнаваў прыроджаныя адольнасці, а таксама правілы розуму, дзякуючы якім чалавек робіць вывады аб сапраўдным існаванні знешніх прадметаў. Крытыкаваў філасофію Канта, фармалізм і схематызм яго логікі і трансцэндэнтальнай эстэтыкі. Псіхалагічныя і пед. погляды Д. апіраюцца на даследаванні здольнасцей чалавека (адчуванняў, уяўленняў, кемлівасці, фантазіі, увагі, памяці, волі і інш.). Лічыў, што здольнасці развіваюцца ў пэўным асяроддзі пастаяннымі практыкаваннямі і паўтарэннем. Эстэтычныя погляды Д.— своеасаблівае спалучэнне класіцызму і рамантызму. Сцвярджаў, што творчасць мастака залежыць ад умоў навакольнага свету, выхавання і культуры, але мастак стварае нейкі новы сусвет. Фантазія — аснoўнае ў мастацтве. Д. лічыў паэзію галоўным жанрам мастацтва.

Тв.: Rozbiór dzieła pt. «O filozofii» przez F. Jarońskiego z uwagami nad nim przez Anioła Dowgirda, «Dziennik Wileński», 1817, rocz. 6; O logice, metafizyce i filozofii moralnej, Wilno, 1821; Wykład przyrodzonych myślenia prawideł, czyli Logika teoretyczna i praktyczna, cz. 1, Połock, 1828; рус. пер.— Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии, Мн., 1962.

Літ.: Дорошевич Э. К. Анпол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения, Мн., 1967 (бібліягр.); Kaczmarek S. Anioł Dowgird — filozof nieznany, Warszawa, 1965. *Э. К. Дарашэвіч.* Мінск.

ДОЎГІЯ КУРГАНЫ, назва валападобных курганоў 2-й пал. 1-га тысячагоддзя, якія належалі *крывічам*. Адлюстроўваюць перыяды гісторыі, калі на Пн Беларусі і суседніх тэрыторыях паявіліся славяне, якія асімілявалі мясцовае балцкае і угра-фінскае насельніцтва і ўтварылі групоўку усх. славян — крывічоў. Мелі некалькі дзесяткаў метраў даўжыні, 8—10 м шырыні, 1—2 м вышыні. Пахавальны абрад — трупаспаленне. У кожным кургане адно або некалькі пахаванняў у гаршках ці на зямлі. З рашткамі пабожчыкаў у курганах трапляюцца шкляныя, бронзавыя і жал. ўпрыгожанні, керамічныя ляпныя посуднны і інш. Д. к. пашыраны ў вярхоўях Зах. Дзвіны, Дняпра, Волгі, Нёмана, на Пскоўшчыне, ёсць на У Латвіі і ў Эстоніі. На тэр.



Раскопкі доўгага кургана (в. Янкавічы Расонскага р-на).

Беларусі Д. к. 5—6 ст. каля в. Янкавічы (Расонскі р-н), 7—8 ст. каля в. Баркі, 9—10 ст. каля в. Рудня і *Глінішча* (Полацкі р-н) і інш. Яны вельмі блізкія да Д. к. Смаленшчыны і адносяцца да адной археал. культуры.

Літ.: Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья, М., 1970; Штыхов Г. В. Археология Полоцкой земли за 50 лет, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1969. *Г. В. Штыхаў.* Мінск.

ДОЎЖА, возера ў бас. Дзісны, у Пастаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,93 км². Даўж. 4,4 км, найб. шыр. 0,3 км, сярэдняя 0,2 км. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (13,2 км²) дробнаўзгорысты. Воз. праточнае, праз яго цячэ рака без назвы. Водзяцца плотка, акунь, лешч, шчупак, лінь, карась.

ДОЎЖЫНА (Доўжыца), возера ў бас. р. Крашанкі, правага прытока Ушачы, у Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,68 км². Даўж. 2 км, найб. шыр. 0,5 км, сярэдняя 0,34 км. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Схілы ўкрыты лесам. Вадазбор (21 км²) слаба ўзгорысты. Д. праточнае: упадае рака (без назвы) з воз. Баркоўшчына, сцёк па пратоцы ў воз. Вечалле. Водзяцца шчупак, гусцяра, акунь, лінь, плотка, лешч.

ДОЎМАНТ (г. н. невяд.— 20.5.1299), князь палыпчанскі і пскоўскі. У 1263 узначаліў змову супраць літ. князя Міндоўга і забіў яго. Пасля завалявання Нальшчан кн. Войшалкам уцёк у 1265 у Пскоў, дзе ў 1266, калі прыняў праваслаўе, выбраны князем. На чале пскоўскіх атрадаў і ў саюзе з ноўгарадцамі рабіў паходы на Літву і супраць Лівонскага ордэна. Пасля смерці кананізаваны царквою.

Літ.: Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов, М.— Л., 1950.

М. І. Ермаловіч. Маладзечна.

ДОЎНАР Станіслаў Альбертавіч (н. 1.1.1919, Мінск), беларускі савецкі вучоны ў галіне металазнаўства і апрацоўкі металаў ціскам. Д-р тэхн. н. (1969). Чл. КПСС з 1943. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Пасля сканчэння Бел. політэхн. ін-та (1950) працуе ў Фіз.-тэхн. ін-це АН БССР, з 1970 заг. лабараторыі біметалічных матэрыялаў гэтага ін-та. Навук. працы па металазнаўстве і пластычнасці металаў. Вынаходствы па новых метадах тэрмічнай і тэрмамех. апрацоўкі кавальскіх штампаў.

Тв.: У кн.— Сборник научных трудов АН БССР, в. 2, Мн., 1955; там жа, в. 3, Мн., 1956.

ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ Мітрафан Віктаравіч [2(14).6.1867, Рэчыца Мінскай губ.— 1934], беларускі бурж. гісторык, фалькларыст і этнограф. Д-р гістар. н. (1905), праф. (1902). З сям'і беззямельнага шляхціца. Скончыў Кіеўскі ун-т (1894). З 1898 у Маскоўскім архіве мін-ва юстыцыі, з 1899 прыват-дацэнт Маскоўскага ун-та, з 1901 Кіеўскага, з 1902 праф. рус. гісторыі, з 1925 правадзейны чл. і кіраўнік гістор.-археал. камісіі Інбелкульта і праф. БДУ. У 1926 выехаў у Маскву. Выдаў шэраг навук. прац, публікацый крыніц, найб. буйныя з якіх прысвечаны пераважна сац.-эканам. гісторыі Беларусі і Літвы. У 1901 абараніў магістэрскую дысертацыю «Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах» (т. 1, Кіеў, 1901), у 1905 — доктарскую «Нарысы па арганізацыі заходнерускага сялянства ў XVI ст.» (Кіеў, 1905). Займаўся вывучэннем гісторыі дзекабрыстаў, упершыню выкарыстаў следчыя матэрыялы, частку якіх апублікаваў. У 1911 распрацаваў курс лекцый «Гісторыя рускай нар. гаспадаркі» (т. 1, Кіеў, 1911), эклектычны па метадалогіі. У 1919 у Гродне выдаў брашуру «Асновы дзяржаўнасці Беларусі», у якой даў бурж.-нацыяналіст. інтэрпрэтацыю гісторыі Беларусі. У 1926—28 выдаў некалькі прац па гісторыі нар. гасп. Беларусі. У працах па этнаграфіі апісваў сямейны побыт, з асаблівай увагай вывучаў вясельныя абрады («Беларускае вяселле і вясельныя песні», 1888), сямейнае звычаёвае права. Выдаў зборнік «Даследаванні і артыкулы» (т. 1, 1909). Збіраў і вывучаў бел. фальклор (зб. «Песні пінчукоў», 1895). Усяго па этнаграфіі і фальклоры апублікаваў больш за 30 прац. Меў цесныя сувязі з бел. этнографамі, фалькларыстамі і пісьменнікамі. Фактычныя матэрыялы прац Д.-З. не страцілі навук. каштоўнасці.



Літ.: Даўгяла З. Літаратурныя працы доктара рускай гісторыі Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага ў храналагічным парадку за 45 год (1883—1928), у кн.: Запіскі аддзелу гуманітарных навук, кн. 8, Працы класа гісторыі, т. 3, Мн., 1929.

М. Ф. Спірыдонаў. Мінск


ДОЎСК, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 31 км на ПнУ ад Рагачова, 90 км ад Гомеля, 14 км ад прыстані каля в. Свержань на Дняпры. Аўтобусная ст. на скрыжаванні шашэйных

дарог Брэст — Рослаўль — Масква і Лепіпдарог Гомель — Адэса. 1700 ж., гасп. 524 (1971). *Гомельская абласная сельскагаспадарчая доследная станцыя* з эксперым. базай «Доўск». Рагачоўская міжраённая ст. штучнага асеменнення жывёлы. Асфальтава-бітумны, цагельны і малочны з-ды, цэх безалкагольных напіткаў Доўскага спажывецкага т-ва, аўтазаправачная ст., швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя школа, пры якой гісторыка-краязнаўчы музей, муз. школа, абл. школа кухараў, Дом культуры, 2 б-кі, 2 дзіцячыя сады, бальніца, аптэка, 3 аддз. сувязі, 8 магазінаў, 3 сталовыя, 2 кафэ, рэстаран, гасцініца. 2 помнікі: на брацкай магіле 139 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну, на брацкай магіле 59 мірных жыхароў Д. і навакольных вёсак, загубленых у сак. 1943 нім.-фаш. захопнікамі. Магіла Героя Сав. Саюза П. А. *Данілава*.

ДОЦІШКІ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр Чыжунскага с/с і калгаса «За Радзіму». За 38 *км* на З ад Воранава, 108 *км* ад Гродна, 25 *км* ад чыг. ст. Бастуны, каля шашы Радунь — Эйшышкес (1,5 *км*). 221 ж., гасп. 77 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў Айч. вайны.

ДРАБЕНЯ Аляксей Захаравіч [14(27).12. 1910, в. Смолічы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 11.7.1966], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1949). У 1934—39 на Магілёўскім аўтарамонтным з-дзе. З 1939 у Ломжынскім райвыканкоме. У партызанах з жн. 1942 — камісар атрада, з мая 1944 камісар *партызанскай брыгады 32-й* імя М. І. Калініна Мінскай вобл. У 1949—54 старшыня Барысаўскага райвыканкома, потым на сав. рабоце ў Слуцку. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ДРАБІЛКА, машына для драблення розных матэрыялаў (граніту, вапны, гіпсу і інш.).



Асн. віды Д. паводле спосабу драблення і канструкцыйных адзнак (гл. рыс.): шчокавыя (*а*, *б*), конусныя (*в*, *г*), валковыя (*д*), малатковыя (*е*, *ж*) і ротарныя (*з*). Кавалкі матэрыялу ў Д. шчокавых, конусных і валковых дробяцца ад націскання на іх рухомых частак (шчок, конусаў, валкоў); у малатковых і ротарных матэрыял крышыцца ўдарамі драбільных малаткоў, якія верцяцца з вялікай скорасцю. Шчокавыя Д.— машыны перыяд. дзеяння. Ротарныя Д., у параўнанні з шчокавымі і конусным, найб. эфектыўныя. Гл. таксама *Млын*, *Бегуны*.

Літ.: Макаров В. И. и Соколов В. П. Машины для дробления и сортировки материалов. Справочник, М.— Л., 1966; Розенович Е. В. Машины для дробления материалов, М., 1966.

ДРАБІНЫ, 1) драўляны воз на чатыры колы для аднаконнай запрэжкі. Асн. сродак транспарту бел. сялянiна ў дарэвалюц. і дакалгасны часы. Гал. часткі: перадок, або раскаты, і задок з восямі, трайня, або лісіца, што злучае восі, аглоблі з атосамі і 2 бакавіны-драбіны з папярочкамі (адсюль і назва воза). Пры перавозцы гною бакавіны ў возе замянялі дошкамі, бульбы — скрыняю. У канцы 19 ст. ў незаможных гасп. Д. звычайна былі на драўляных восях з неакаванымі коламі. У калг. вёсцы Д. амаль цалкам заменены аўтатранспартам. 2) Драўляная прыстаўная лесвіца

ДРАБЛЕННЕ (у біялогіі), сегментацыя яйца, пачатковая стадыя развіцця шматклетачнага арганізма, на працягу якой аплодненая яйцаклетка паслядоўна дзеліцца на даччыныя клеткі (бластамеры).

Пры Д. дзеліцца ядро і цытаплазма. У гэты час клетка не расце. Адрозніваюць Д. поўнае — голабластычнае (дзеліцца ўсё яйцо) і частковае — мерабластычнае (сегментуецца на бластамеры толькі полюс клеткі, дзе размешчана ядро). Поўнае ўласцівае яйцаклеткам з малою колькасцю раўнамерна размеркаванага жаўтка (у кішачнаполасцевых, малюскаў, ланцэтніка, плацэнтарных млекакормячых); частковае — яйцаклеткам з вялікай колькасцю жаўтка (у рыб, паўзуноў, птушак, ніжэйшых млекакормячых).

Літ.: Токин Б. П. Общая эмбриология, Л., 1966; Шмидт Г. А. Эмбриология животных, ч. 1, М., 1951. *А. В. Пішчынскі*. Мінск.

ДРАБНАСОПАЧНІК, скопішча невысокіх круглаватых узгоркаў і кражаў выш. 300—500 *м*, падзеленых паніжэннямі з азёрамі, балотамі, саланчакамі. Д. утварыўся ад працягнутага разбурэння і дэнудацыі горнай краіны пераважна ва ўмовах кантынентальнага клімату, напр. *Казахскі драбнасопачнік*.

ДРАБЯЗКА Сцяпан Рыгоравіч (н. 7.8.1922, в. Уюнішча Сасніцкага пав. Чарнігаўскай губ.), беларускі савецкі юрыст. Д-р юрыд. н. (1970). З сялян. Чл. КПСС з 1945. У 1940—45 у Сав. Арміі. Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1949). З 1950 выкладчык гэтага ін-та, з 1955 дацэнт, з 1970 праф. кафедры тэорыі дзяржавы і права юрыд. ф-та БДУ. Даследуе праблемы заканадаўчай дзейнасці вышэйшых органаў дзярж. улады СССР і саюзных рэспублік, праблемы эфектыўнасці заканадаўства ў рэгуляванні грамадскіх адносін.

Тв.: Комиссии Верховного Совета союзной республики, М., 1961; Право и материально-техническая база коммунизма, М., 1967.

ДРАВЯНІКІ, вёска ў Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 14 *км* на ПнЗ ад Астраўца, 253 *км* ад Гродна, 8 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 180 ж., гасп. 54 (1971). Атэлье быт. абслугоўвання. Пач. школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДРАГА (англ. drag), плывучы агрэгат для механізаванай распрацоўкі россыпных радовішчаў карысных выкапняў.

Складаецца з пантона, чарпалкі, абсталявання для прамыўкі, абагачэння і адвалу пароды, механізмаў перамяшчэння Д. па вадаёме. Прывод пераважна электрычны, малых Д.— ад дызельнага рухавіка. Звычайна Д. распрацоўваюцца россыпныя

радовішчы ў далінах рэк, на ўзбярэжжах мораў і азёраў. Калі радовішча недастаткова абводнена, да яго папярэдне падводзяць ваду. Глыбіня распрацоўкі: мінімальная 2—4 *м* ад паверхні вады, максімальная да 30—40 *м*; шырыня не менш як 25—40 *м*. Вынятка Д. самародных металаў і мінералаў з горнай пароды дасягае 95%.

Літ.: Алексеев П. А. и Николаевский М. В. Как устроена и как работает драга, Магадан, 1959; Лешков В. Г. Справочник дражника, М., 1968.

ДРАГАТЫНЬ, вёска ў Наваельненскім с/с Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Свярдлова. За 24 *км* на ПдЗ ад Краснапольля, 164 *км* ад Магілёва, 84 *км* ад чыг. ст. Крычаў. 205 ж., двароў 69 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ДРАГІЧЫН, горад (з 1967), цэнтр Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. За 110 *км* на У ад Брэста, 7 *км* ад чыг. ст. Драгічын. Аўтобусная ст. на лініі Брэст — Пінск. 7,1 тыс. ж. (1971).

Д. вядомы з 12 ст. У 15—16 ст. належаў пінскім князям Давечаровічам. У 17 ст. заштатны горад, пазней — мястэчка. У 1892 было 3475 жыхароў. У 1915 захоплены нім. войскамі, вясной 1919 войскамі бурж. Польшчы. У 1921—39 павятовы цэнтр Палескага ваяводства Польшчы. У Д. у 1934 адбыўся працэс 29 чл. КПЗБ. З чэрв. 1941 да 17.7.1944 акупаваны нім.-фаш. захопнікамі.

Прамысл. прадпрыемствы: маслазавод, харчкамбінат, трактарарамонтны з-д, раённае і спецыялізаванае аб'яднанні Сельгастэхнікі,



Драгічын. Вуліца Ленінская.

камбінат быт. абслугоўвання. Будуецца (1971) камбікормавы з-д. З сярэднія і завочная школы, школа рабочай моладзі, музычная і дзіцячая спарт. школы, прафес.-тэхн. вуч. механізацыі с. гасп., 2 дашкольныя ўстановы, Дом піянераў, Дом культуры, 2 кінатэатры, 2 масавыя б-кі, бальніца. Помнік У. І. Леніну. Два помнікі сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну. Мемарыяльная дошка ў гонар партыз. брыгады «Савецкая Беларусь», якая дзейнічала на тэр. раёна. Каля Д. ў фальварку Людвінава жыла Э. *Ажэшка*.

ДРАГІЧЫНСКАЯ БІТВА 1237, бітва паміж войскамі валынскага князя Данілы Галіцкага і нямецкімі рыцарамі пад Драгічынам на Бузе. У 30-я г. 13 ст. ням. рыцары Дабжынскага ордэна выкарысталі міжусобную барацьбу рус. князёў і захапілі Драгічынскую вол. Берасцейскай зямлі. У 1237 Даніла Галіцкі разбіў рыцараў ордэна на чале з іх магістрам Бруна, большасць іх захапіў у палон і вызваліў Драгічын. Пасля Д. б. Дабжынскі ордэн распаўся і аліўся з Тэўтонскім.


ДРАГІЧЫНСКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. На Пд вобласці каля граніцы з УССР. Пл. 1,9 тыс. *км*². Нас. 64,4 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 14 сельсаветаў; г. п. Антопаль. Цэнтр г. Драгічын.

Паверхня раёна нізінна-раўнінная. На Пд і З плоская значна забалочаная нізіна *Брэсцкага Палесся* (выш. 140—150 *м*), на аднастайным фоне якой выдзяляюцца злёгку прыўзнятыя пясчаныя грывы. На ПнУ платопадобная водналедавіковая раўніна *Загароддзе* (выш. да 173 *м* над узр. м). На крайняй Пн забалочаная даліна р. Ясельды. Карысныя выкапні: 4 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 37,2 млн. *т* (у т. л. радовішчы Пушыцавае — 20,6 млн. *т* і Масткі — 7,3 млн. *т*); 3 радовішчы цагельнай сыравіны — 1,3 млн. *м*³ (у т. л. радовішча Свеклічы — 0,8 млн. *м*³); радовішча мелу Бездзеж — 1,2 млн. *т*; радовішча буд. пяскоў Аэрадром (за 4 *км* на ПнУ ад Драгічына) — 0,8 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. ад −4,5 да −5 °С, ліп. 18,5—19 °С. Ападкаў 629 *мм* за год. Вегет. перыяд 203 дні. На Пд раёна суднаходны *Дняпроўска-Бугскі канал*, ёсць меліярац. каналы (Белазерскі і інш.). На Пн цячэ Ясельда з прытокамі Ласінцы, Плёса і інш. У межах раёна часткова размешчаны азёры Спораўскае (на ПнУ) і Белае (на Пд). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (6,9%), дзярнова-падзолістыя забалачаныя (35,5%), дзярнова-балотныя (33,9%), тарфяна-балотныя (23,7%). З мінер. глебаў 53,1% супясчаных, 46,9% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 48 (цана бала 0,23 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 33, усіх с.-г. угоддзяў — 40. Пад лесам 24,1% тэр. Асн. лясныя масівы на Пд і У раёна. Хваёвыя лясы займаюць палову, а бярозава-асінавыя і альховыя — 1/3 укрытай лесам плошчы, пашыраны дуб, граб, ясень. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы, палякі і інш. Сярэдняя шчыльнасць 34 чал. на 1 *км*². Гарадскога насельніцтва 14,8%.

Прамысловасць: харчовая — маслазавод, камбінат харч. канцэнтратаў (Драгічын),

Уборка аўса ў калгасе «Світанне».





На Драгічынскім трактарарамонтным заводзе.


спіртзавод (Закозель); металаапрацоўчая — трактарарамонтны з-д і раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі (Драгічын); у г. п. Антопаль прамкамбінат (ватны і вяровачны цэхі, цагельны з-д); камбінат быт. абслугоўвання. Паблізу Драгічына будуецца (1971) камбікормавы з-д. У раёне 23 калгасы і 2 саўгасы (1971).

Калгасы і іх цэнтры: імя XX з'езду КПСС *(Осаўцы)*, імя Дзімітрова *(Заверша)*, «Дружба» *(Зарэчка)*, «Искра» *(Нямержа)*, імя Калініна *(Брашэвічы)*, імя Кірава *(Хомск)*, імя Леніна *(Вулька-Радавецкая)*, «Маладая гвардыя» *(Ліпнікі)*, «Маркавічы» *(Маркавічы)*, імя К. Маркса *(Асіпавічы)*, «Новы шлях» *(Бездзеж)*, «1 Мая» *(Антопаль)*, «Праўда» *(Равіны)*, «Радзіма» *(Імянін)*, «Савецкая Беларусь» *(Белін)*, «Світанне» *(Папіна)*, імя Суворава *(Вулька)*, «Сцяг Леніна» *(Гутава)*, «30 гадоў БССР» *(Аляксеевічы)*, імя Чкалава *(Галоўчыцы)*, «Чырвоны Кастрычнік» *(Корсунь)*, «Чырвоны партызан» *(Радастава)*, імя Энгельса *(Дзяткавічы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Драгічынскі» *(Драгічын)*, «Закозельскі» *(Закозель)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі і буракаводстве ў спалучэнні з ільнаводствам; вырошчваюць збожжа і бульбу. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 54% тэр. На пач. 1970 асушана 33,1 тыс. *га* балот і забалочаных зямель, у т. л. на тарфяніках 10,6 тыс. *га*. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 45,5, з іх пад збожжавымі і зернебабовымі 18,3, тэхнічнымі (лён, цукр. буракі) 3,9, бульбай 9,6, кармавымі культурамі 13,4. На пач. 1971 у раёне (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 54,1 (у т. л. кароў 27,2), свіней 25,1, авечак 9,1. Па тэр. раёна праходзяць чыгунка Жабінка — Гомель і аўтамаб. дарогі Брэст — Пінск, Драгічын — Бяроза, Драгічын — Хомск, Антопаль — Бяроза. Важнае гасп. значэнне мае Дняпроўска-Бугскі канал.

У 1971 у раёне было 19 сярэдніх, 26 васьмігадовых, 56 пач. школ, 2 школы-інтэрнаты, завочная і 2 школы рабочай моладзі, 4 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, сельскае прафесійна-тэхн. вуч. механізацыі с. гасп., 50 клубных устаноў, 3 кінатэатры, 75 масавых б-к, 51 кінаўстаноўка, у т. л. 45 стацыянарных, 7 бальніц, 24 фельч.-ак. пункты. У раёне (1970) 602 спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 29 інжынераў, 33 аграномы, 23 заатэхнікі і вет. ўрачы, 472 настаўнікі, 45 урачоў; 1108 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Запаветы Леніна».

Я. Г. Гуцаў. Мінск; *А. М. Краўчук.* Брэст.




ДРАЖНА, вёска ў Старадарожскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Беларусь». За 18 *км* на Пн ад Старых Дарог, 125 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе Старыя Дарогі — в. Дрычын. 682 ж., гасп. 253 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, магазін. У грамадз. вайну Д. спалілі польскія інтэрвенты, а ў красавіку 1943 часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 27 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ДРАЗАФІЛА, плодовая мушка (Drosophila melanogaster), насякомае сям. Drosophilidae атр. двухкрылых. Пашырана амаль ва ўсім свеце.

Даўж. да 3 *мм*. Цела шэрае, вочы чырвоныя. Жывіцца прадуктамі гніення садавіны і агародніны. Вельмі плодная.

Мае невялікую колькасць храмасомаў, шматлікія і разнастайныя спадчынныя змены, хутка развіваецца (10 сутак пры т-ры 25 °С); лёгка разводзіцца ў лабараторных умовах. Класічны аб'ект для генет. даследаў. Даследаванні на Д. выявілі шэраг асн. заканамернасцей сучаснай генетыкі (храмасомную тэорыю спадчыннасці, генет. тэорыю вызначэння полу, асаблівасці мутагенезу і інш.). Д. выкарыстоўваецца таксама ў даследаваннях па касм. біялогіі.



Самец (злева) і самка дразафілы.

Літ.: Дубинин Н. П. Общая генетика, М., 1970; Медведев Н. Н. Практическая генетика, 2 изд., М., 1968.

Р. І. Ганчарова. Мінск.


ДРАЗДОВА Лілія Сцяпанаўна (н. 12.6.1927, г. Байрам-Алі Туркм. ССР), беларуская і руская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1953). Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (1950, педагог К. Саннікаў) у т-ры імя Я. Купалы. Выканаўца роляў гераінь. Сярод іх: Насця («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, Дзярж. прэмія СССР 1952), Алена («Салавей» З. Бядулі), Дуня («Простая дзяўчына» К. Губарэвіча), Таня («Таня» А. Арбузава), Ніна Зарэчная («Чайка» А. Чэхава). Здымалася ў бел. фільмах «Паўлінка», «Несцерка», «Хто смяецца апошнім», «Пяюць жаваранкі». З 1957 працуе ў Горкаўскім т-ры імя М. Горкага. Ролі: Насця («На дне» М. Горкага), Любоў Яравая (аднайм. п'еса К. Транёва), Ганна-Ліза («Пасажырка» З. Посмыш) і інш. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

ДРАЗДОВІЧ Вікенцій Іосіфавіч (1911, в. Навасёлкі Слуцкага пав. Мінскай губ.— 3.12.1942), удзельнік партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1965). З сялян. Чл. КПСС. Да вайны на сав. рабоце ў Капыльскім і Клецкім р-нах. З жн. 1941 вёў работу па стварэнні падпольных арг-цый на радзіме. З ліп. 1942 у партыз. атрадзе імя Катоўскага брыгады імя Варашылава — камандзір узвода. У час карнай экспедыцыі гітлераўцаў супраць капыльскіх партызанаў у Лаўскім лесе Д. узначаліў партыз. засаду каля в. Клецішча. Партызаны адбілі 8 атак фаш. батальёна, аднак былі акружаны і ўсе загінулі ў няроўным баі (гл. *Лаўскі бой 1943*). На месцы бою скульптурны помнік.



Літ.: В едином строю. Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии. 1941—1944, Мн., 1970 (гл. Паказальнік імён).

ДРАЗДОВІЧ Язэп Нарцызавіч [1(13).10.1888, засценак Пунькі Дзісенскага пав. Віленскай губ.— 1954 (?)], беларускі графік і жывапісец. У 1906—10 вучыўся ў Віленскай рысавальнай школе. Сярод ранніх прац: афармленне «Беларускага календара на 1910 год», песенных зборнікаў А. Грыневіча, «Курганнай кветкі» К. Буйло (1914). У 20-я г. мастак прагрэс. зах.-бел. часопіса *«Маланка»*. Вядомы яго этнагр. замалёўкі і графічная серыя старадаўняй архітэктуры Беларусі і Літвы: «Глыбокае» (1926), «Мір» (1927), «Навагрудак» (1928), «Крэва», «Ліда», «Меднікі», «Троякі»; «Гальшанскае гарадзішча каля Барунскага тракту» (усе 1929). Стварыў партрэты А. Грыневіча, Усяслава Полацкага, Ф. Скарыны. Запісваў нар. песні, збіраў і апрацоўваў для слоўнікаў лексіку нар. мовы.



Я. Н. Драздовіч. Гальшанскае гарадзішча каля Барунскага тракту. Малюнак. 1929.

Літ.: Лісс А. Шлях і пошукі, «Полымя», 1964, № 3.

А. С. Ліс. Мінск.

ДРАЗДОЎСКІЯ (Drozdowscy), рускія і польскія акцёры 19 ст., бацька і дачка. Працавалі ў Мінскім гарадскім т-ры.

В. Драздоўскі (г. н. невяд.— 1850), камедыйны акцёр, рэжысёр і антрэпрэнёр. У Мінску працаваў з 1840 (трупа Я. Хелмікоўскага), іграў на польск. і рус. мовах. З 1847 да 1850 рэж. і антрэпрэнёр. Упершыню ў яго трупе пастаўлены ў Мінску п'есы М. Гогаля, І. Катлярэўскага, М. Някрасава, Р. Квіткі-Аснаўяненкі, П. Каратыгіна, Ф. Коні, П. Грыгор'ева.

М. Драздоўская (г. н. і см. невяд.), драм. актрыса і спявачка (мецца-сапрана). У 1847—63 працавала ў Мінскім гарадскім т-ры. Выканаўца вадэвільнага рэпертуару. Для яе кампазітар Ф. Міладоўскі напісаў аперэту «Канкурэнты» (тэкст М. Ланіцкага і У. Сыракомлі, прэм'ера ў Мінску 12.2.1861). У канцэртным рэпертуары творы А. Варламава, М. Глінкі, нар. песні.

Г. І. Барышаў. Мінск.

ДРАЗДЫ, драздовыя (Turdidae), сямейства птушак атр. вераб'іных. 304 віды. Пашыраны пераважна ў Еўропе, Азіі і Амерыцы. У СССР 50, на Беларусі 14 відаў, аб'яднаных у 6 родаў: уласна Д. (Turdus), *каменкі, чаканы, гарыхвосткі, салаўі, заранкі*. Род уласна драздоў у арнітафаўне СССР мае 15 відаў, у БССР 6: рабінник (T. pilaris), дзяраба (T. viscivorus), пеўчы Д. (T. ericetorum), белабрывік (T. musicus), Д. Наўмана (T. naumanni) і чорны Д. (T. merula).



Пеўчы дрозд.

Даўж. цела Д. 13—40 *см*, маса 13—200 *г*. Апярэнне птушак стракатае,

бурае, чорнае. Найчасцей пералётныя птушкі, якія гняздуюцца на дрэвах, таксама на кустах і на зямлі, парамі ці невялікімі калоніямі. Нясуць 5—6 рабых яец. Гадуюць за лета пераважна 2 пакаленні. Кормяцца насякомымі, чарвякамі, слімакамі, ягадамі. Часам шкодзяць садам.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).
Р. К. Кажэўнікава. Мінск.

ДРАЗНІН Навум Майсеевіч (н. 3.5.1923, г. Оўруч Валынскай губ. УССР), беларускі савецкі вучоны ў галіне эндакрыналогіі. Д-р мед. н. (1964), праф. (1966). У 1945 скончыў Харкаўскі мед. ін-т. Заг. эндакрыналагічнай клінікі ў Мінску (з 1955) і заг. кафедры эндакрыналогіі Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў (з 1960). Распрацаваў методыку ўжывання радыеактыўных ізатопаў у эндакрыналогіі. Асн. працы па дыягностыцы хвароб шчытападобнай залозы, класіфікацыі і лячэнні цукр. дыябету. Старшыня праўлення т-ва эндакрынолагаў БССР (1956). Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 2-й ступені, медалямі.

Тв.: Радиоактивный йод в клинике, Мн., 1961; у кн.: Основы эндокринологии, Мн., 1967.

ДРАЙЗЕР (Dreiser) Тэадор (27.8.1871, г. Тэрэ-Хот, штат Індыяна — 28.12.1945), амерыканскі пісьменнік. Чл. кампартыі ЗША з 1945. Сын абяднелага імігранта з Германіі. Працаваў журналістам (1892—1910). Першы раман «Сястра Керы» (1900). Раман «Джэні Герхарт» (1911) — пра лёс дзяўчыны з народу. У рамане «Геній» (1915) паказаў трагедыю мастака ў капіталіст. Амерыцы. Сусв. вядомасць набылі «Трылогія жадання» («Фінансіст», 1912; «Тытан», 1914; незакончаны раман «Стоік», апубл. 1947) і «Амерыканская трагедыя» (1925), у якіх з бязлітасным рэалізмам выкрыты антыгуманістычны, драпежніцкі характар амер. бурж. грамадства. Вітаў Кастр. рэв. Уражанні ад паездкі ў СССР (1927) апісаў у кн. «Драйзер глядзіць на Расію» (1928). Трагізм капіталіст. рэчаіснасці адлюстраваў у зб. апавяд. «Вызваленне» (1918), «Дванаццаць мужчын» (1919), «Фарбы вялікага горада» (1923), «Ланцугі» (1927) і «Галерэя жанчын» (1929). У аповесці «Эрніта» (1929) упершыню ў амер. л-ры даў станоўчы вобраз камуніста. Публіцыст. кнігі: «Трагічная Амерыка» (1931) і «Амерыку трэба выратаваць» (1941), напісаны з пазіцый сацыяліст. рэалізму. Раман «Апора» (1946) надрукаваны пасмяротна. Выступаў на абарону гераічнай барацьбы сав. народа супраць гітлерызму.



Тв.: Рус. пер.— Собр. соч., т. 1—12, М., 1951—55.
Літ.: Засурский Я. Н. Теодор Драйзер, М., 1964.
А. М. Нікалаюкін. Масква.

ДРАП-ХМАРА Міхайла [сапр. Драй Міхайла Панасавіч; 28.9(10.10).1889, в. Малыя Капіўцы Залатаношскага пав. Палтаўскай губ.— 19.1.1939], украінскі савецкі паэт і літаратуразнавец. З сялян. Скончыў Кіеўскі ун-т (1913). Аўтар зб. вершаў «Прорасць» (1926), даследаванняў па гісторыі ўкр., польскай і бел. л-р, артыкула па гісторыі бел. мовы «Фрагменты Мінскага пергаментнага апракаса XIV ст.» (1931). Пераклаў на ўкр. мову творы многіх замежных паэтаў. Першы ў Сав. Украіне перакладчык і папулярызатар творчасці М. Багдановіча (зб. «Вянок», 1929). Адзін з ініцыятараў выдання літ. альманаха «Нова Білорусь» (1929).

Тв.: Вибране, Київ, 1969 (Прадмова С. Крыжанівскага).
В. А. Чабаненка. Запарожжа.

ДРАПЧУК Якаў Іванавіч [н. 21.10(3.11).1901, в. Ржаўка Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.], удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, ген.-м. авіяцыі (1946).



З сялян. Чл. КПСС з 1925. У Чырв. Арміі з 1920. З 1921 у часцях спец. прызначэння (ЧОН) Гомельскай губ. Удзельнік барацьбы з бандытызмам на Магілёўшчыне. У 1924—32 у рэдакцыі газ. «Новая деревня» (орган Гомельскага губкома), на парт. і сав. рабоце. З 1933 на парт. рабоце ў ВПС. У Айч. вайну на Паўн.-Зах. і 1-м Бел. франтах. З 1944 у ВПС Войска Польскага. У родным вёсцы з дапамогай Д. збудавана б-ка, якой ён перадаў больш за 23 тыс. экз. кніг. Узнаг. 5 ордэнамі, медалямі, 3 ордэнамі ПНР. Жыве ў Люберцах Маскоўскай вобл.

ДРАКАНІДЫ, рой метэорных часцінак, *радыянт* якіх знаходзіцца ў сузор'і *Дракона*. Гл. *Метэорныя патокі*.

ДРАКОН (лац. Draco), каляпалярнае сузор'е паўн. паўшар'я неба. Ломаны ланцужок слабых зорак Д. агінае Малую Мядзведзіцу і заканчваецца больш яркай зоркай γ (2-й зорнай велічыні), назіраючы за якою англ. астраном Дж. Брадлей адкрыў (1728) *аберацыю святла*. На тэр. БССР Д. відаць круглы год. Гл. *Зорнае неба*.

ДРАКОНАВЫ ГОРЫ (Drakensberg), на ПдУ Афрыкі, частка Вялікага Уступу. Даўж. каля 900 *км*. Найвыш. пункт Д. г. і Паўд. Афрыкі Каткін-Пік (3650 *м*).

Складзены пераважна з дэвонскіх вулканічных сланцаў, пясчанікаў і базальтаў. З'яўляюцца водападзелам паміж рэкамі Індыйскага ак., якія праразаюць іх усх. стромкі схіл, і вярхоўямі р. Аранжавай. Рэзка адрозніваюцца клімат і расліннасць усх. і зах. схілаў. На ўсх. вільготных да 1200 *м* трапічныя дажджавыя лясы, вышэй лісцевыя і хвойныя лясы, калючыя хмызняковыя зараснікі, горныя лугі і каменныя россыпы. На сухіх зах. схілах саваны і хмызняк.

ДРАКОНТА ЗАКОНЫ (Драконα законы), пісьмовы помнік права Старажытных Афінаў. Выдадзены архонтам (вышэйшая дзярж. пасада ў Афінах) Драконтам у 621 да н. э. і запісаны на каменных плітах. Паводле звестак Плутарха Д. з. былі вельмі жорсткія: пакаранне смерцю назначалася нават за нязначныя парушэнні (крадзеж агародніны, садавіны). Д. з. сталі назыўнымі пры азначэнні

жорсткіх мерапрыемстваў («драконавы меры», «драконавы законы»).

Літ.: Аристотель. Афинская полития. Государственное устройство афинян, пер. [з грэч.], 2 изд., М., 1937.

ДРАМА (грэч. drama дзеянне), род літаратуры, які ў адрозненне ад эпасу і лірыкі адлюстроўвае сац. канфлікты і супярэчнасці рэчаіснасці ў непасрэдным дзеянні, праз сутыкненне характараў і прызначаецца для сцэнічнага выканання. Маст. форма Д. спалучае драм. дыялогі і маналогі з тэкстам ад аўтара (т. зв. рэмаркамі). Драматычны канфлікт — аснова Д. Грунтуецца на процістаўленні герояў і на перажыванні імі канфліктнай сітуацыі. Глыбіня і вастрыня выяўленых у Д. паліт., псіхал., маральных і бытавых канфліктаў вызначае драматызм Д. і сілу яе эмац. ўздзеяння.

Першапачатковыя элементы Д. былі ў народна-абрадавай гульні (дыялог аб'ядноўваўся з танцамі, спевамі, пантамімаю і г. д.). Паступова Д. вылучылася ў самастойны род літаратуры. Асн. жанры яе — *трагедыя*, драма (у вузкім сэнсе), *камедыя*. Значнага развіцця (6—5 ст. да н. э.) дасягнула ва ўмовах рабаўладальніцкай дэмакратыі ў Ст. Грэцыі (трагедыі Эсхіла, Сафокла, Еўрыпіда, камедыі Арыстафана). Спалучала трагічнае асэнсаванне супярэчнасцей рэчаіснасці з яснасцю і цэльнасцю чалавечай асобы. Традыцыі грэч. Д. былі прадоўжаны ў Рыме (камедыі Плаўта). Набыццё свецкага і нар. элемента ў сярэдневяковай Д. (маралітэ, фарс і г. д.) шмат у чым падрыхтавала новы росквіт Д. ў эпоху *Адраджэння* (У. Шэкспір у Англіі, Лопэ дэ Вэга ў Іспаніі). Шэкспіраўская Д. раскрывала ідэал вызваленай ад сярэдневяковых абмежаванняў духоўна багатай асобы, вызначалася яркім гуманіст. пафасам. Адначасова вылівала трагедыйны бок бурж. гуманізму (трагедыя «Гамлет» і інш.). У паказе ўлады золата шэкспіраўская Д. не страціла свайго ўнутранага адзінства. Крызіс бурж. гуманізму і страта ўнутранага адзінства Д. адбіліся ў творчасці П. Кальдэрона (Іспанія). У 17 ст. ў Францыі (у іншых еўрап. краінах у 18 ст.) фарміруецца класіцысцкая Д. (трагедыі П. Карнеля, Ж. Расіна). Сцвярджала сілу і веліч абсалютысцкай манархіі, пазней (18 ст.) набыла тыранаборскую скіраванасць (Вальтэр у Францыі, Альф'еры ў Італіі). Сцвердзіла прынцып тыпізацыі чалавечых характараў. Станаўленне класіцысцкай камедыі звязана перш-наперш з творчасцю Ж. Б. Мальера і К. Гальдоні, узбагачанай традыцыямі нар. франц. і італьян. т-раў. У 18 ст. ў Англіі, а потым у Францыі і Германіі з выхадам на гістар. арэну класа буржуазіі з'яўляецца «мяшчанская драма» (Д. Дзідро, Г. Лесінг — прадстаўнікі асветніцкага рэалізму). У камедыях П. Бамаршэ ўпершыню ў гісторыі сусв. драматургіі класавы канфлікт стаў у аснове драм. твора. Як антыпод класіцысцкай паляўляецца Д. сентыменталізму, ням. варыянт якой — Д. перыяду «*Буры і націску*» (ранняя драма Ф. Шылера, І. В. Гётэ). Вялікае маст. значэнне набывае пазнейшая драма Гётэ і Шылера (іх т. зв. «веймарскі» класіцызм, канец 18 — пач. 19 ст.), у якой глыбока па-філасофску, з пазіцый рэалізму асэнсоўваюцца супярэчнасці буржуазнага грамадства, што тады нараджаліся. Рамант. Д. пераважае ў 20—30-я г. 19 ст. (п'есы В. Гюго, Дж. Байрана, М. Вёршмарці, Ю. Славацкага, Г. Гейнэ), у творчасці шэрагу драматургаў дасягае сапраўднай народнасці. Тыпізацыя характараў у рамант. Д. стала грунтавацца на прынцыпе індывідуалізацыі. Дзякуючы развіццю крытычнага рэалізму рамант. Д. выцясняецца рэалістычнай. З прыходам у драматургію Б. Шоў, Р. Ралана, пазней Дж. Голсуарсі рэаліст. Д. стварыла шматгранныя, востраканфліктныя малюнкі жыцця, адлюстравала важнасць жыццёва-сац. абставін пры абмалёўцы чалавека. У 19—20 ст. Д. вылучаецца ў асобны від, адметны ад трагедыі і камедыі.

На мяжы 19—20 ст. развіваюцца іншыя віды Д. Новы перыяд у развіцці зах.-еўрап. Д. пачынае Г. Ібсен, майстар рэаліст. сац.-псіхал. і сімвалі-ка-філас. Д. Прынцыпы натуралізму адстойвалі Э. Заля і ранні Г. Гаўптман, пачынальнікам сімвалісцкай Д. стаў М. Метэрлінк, імажынісцкай — Э. Верхарн. У найлепшых п'есах гэтыя пісьменнікі адмаўлялі свет, заснаваны на сац. несправядлівасці. Гуманістычныя і рэаліст. традыцыі развівае прагрэсіўная зах.-еўрап. і амерыканская Д. ў 20 ст. (А. Мілер у ЗША, О'Кейсі ў Англіі, Х. Лакснес у Ісландыі, Э. Дэ Філіпа ў Італіі). Заганы бурж. грамадства — у п'есах Ф. Дзюрэнмата (Швейцарыя), Ж. Ануя (Францыя), Т. Уільямса (ЗША). Сацыяліст. ідэал у еўрап. Д. адным з першых пачаў сцвярджаць Б. Брэхт. У процілегласць «драме ідэй» (пісьменнікі розных сац.-філас. поглядаў: Б. Шоў — Англія, Л. Пірандэла — Італія, Ж. Жыраду — Францыя і інш.) у 50-я г. ўзнікае драматургія «абсурду», якая адмаўляе сэнс жыцця (С. Бекет, Э. Іанеска). Гал. змест сучаснай сусв. Д.— барацьба дзвюх ідэалогій, буржуазнай і сацыялістычнай, шматлікія сац. праблемы 20 ст.

Рус. Д. пры станаўленні адчула ўплыў еўрап. Д. (з 18 ст.). Драматургію рус. класіцызму стварылі А. Сумарокаў і М. Ламаносаў. У 19 ст. рус. Д. становіцца ідэйна і творча самастойнаю, крытычны рэалізм дасягае ў ёй высокага развіцця (рэаліст. тэндэнцыі выразныя ўжо ў Дз. Фанвізіна, канец 18 — пач. 19 ст.). Першая значная рэаліст. Д.— сацыяльная сатыр. камедыя А. Грыбаедава «Гора ад розуму». А. Пушкін («Барыс Гадуноў») і М. Гогаль («Рэвізор») вывелі рус. Д. на сусв. сцэну. І. Тургенеў, М. Салтыкоў-Шчадрын, А. Сухава-Кабылін прадоўжылі і развілі крытычны рэалізм у Д. Этапам у развіцці рус. рэаліст. Д. з'явілася народная ў сваёй аснове сац.-бытавая драма А. Астроўскага. Грамадскія заганы, бесчалавечнасць самадзяржаўнага ладу знайшлі глыбокае сац.-філас. ўвасабленне ў п'есах Л. Талстога. На мяжы 19—20 ст. з рэалістычнай, сац.-псіхалагічнай, па-мастацку наватарскай Д. выступаюць А. Чэхаў і М. Горкі. Чэхаў узбагачаў Д. тонкім раскрыццём складанасцей духоўнага жыцця, стварыў аснову для перадавой рэаліст. Д. 20 ст. Горкі напоўніў Д. рэвалюцыйным, сац. зместам, стаў пачынальнікам Д. сацыяліст. рэалізму. Сав. Д. раскрывае тэму рэвалюцыі (У. Маякоўскі, У. Біль-Белацаркоўскі, К. Транеў, У. Іванаў, Б. Лаўранёў, У. Вішнеўскі і інш.), будаўніцтва сацыяліст. грамадства. Ствараюцца сац.-бытавыя п'есы Б. Рамашова, псіхал. драма А. Афінагенава, Л. Лявонава, камедыі В. Шкваркіна і інш. М. Пагодзін адкрывае сав. Ленініяну ў Д. («Чалавек з ружжом»). У Айч. вайну паяўляюцца п'есы А. Карнейчука, К. Сімонава і інш. У пасляваенныя гады пішуць драмы А. Штэйн, А. Арбузаў, В. Розаў, М. Шатроў, Л. Валодзін, Л. Зорын, А. Салынскі і інш. Значнага развіцця дасягнула Д. братніх народаў (А. Карнійчук, І. Мікітэнка, І. Качарга, А. Якабсон, А. Грыгуліс, Дж. Джабарлы, С. Вургун, Ш. Дадыкі, Хамза і інш.). Сав. Д. раскрывае прыгажосць, веліч чалавечай дзейнасці ў імя высакароднай мэты, плённа ўплывае на развіццё прагрэсіўнай замежнай Д.

Вытокі бел. Д. ў нар. творчасці — абрадавай паэзіі, рэпертуары *скамарохаў*, у драматызаваных гульнях і *інтэрмедыях*, *батлейцы* (з 16 ст.), школьнай драме 17—18 ст. (дэкламацыі Сімяона Полацкага, «Камедыя» К. Мараш эўскага, камедыя М. Цацэрскага; гл. таксама *Дыялог*, *Школьны тэатр*), *народнай драме* (з 18 ст.). Найб. развіцця дасягнула драматургія ў народных відах т-ра, яна дала пачатак прафесійнай бел. камедыі і драме (нараджаецца ў 19 ст.). В. Дунін-Марцінкевіч у сцэнічных творах («Сялянка», «Пінская шляхта», «Залёты») шырока выкарыстаў нар. звычаі, фальклор, фарсавыя і водэвільныя моманты, з крытычных рэаліст. пазіцый выкрыў царскі суд Расіі, бюракратызм, хабарніцтва, бурж. мараль, якую спараджаў капіталізм. На пач. 20 ст. побач з камедыяй паспяхова развіваецца сац.-псіхалагічная драма, паяўляюцца лірычная Д., п'еса-казка і інш. Пра высокае маральнае аблічча селя-

піна і заганы ў вясковым побыце піша К. Капінец («У іншым шчасці пяцчасце схавана», «Двойчы прапілі», «Модны шляхцюк»), пра трагічны лёс прыгнечаных — Л. Родзевіч («Блуднікі»). Сац. тэматыкай, нар. побытам праслякнуты драм. творы Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Буйло, К. Вясёлага. Вяршыня бел. дакастр. Д. — камедыя «Паўлінка» і сац.-псіхал. драма «Раскіданае гняздо» Я. Купалы. Яны вызначаюцца ідэйнай глыбінёй, народнасцю, рэалізмам, псіхал. распрацоўкай характараў. Пісьменнік з рэвалюцыйна-дэмакр. пазіцый глыбока раскрыў сац. канфлікты часу, паказаў рост самасвядомасці прац. сялянства, якое ўздымалася на барацьбу з самадзяржаўным ладам, за сац. і нац. вызваленне. Драма Я. Купалы — здабытак бел. класічнай драматургіі.

Асн. тэма першых бел. сав. Д. — жыццё і барацьба народа ў дарэвалюц. перыяд, адметная рыса — выкарыстанне фальклорна-рамант. скарбаў, спалучэнне драматычнага і трагедыйнага з камічна-вадэвільным. Паяўляюцца п'есы М. Чарота, В. Гарбацэвіча, Е. Міровіча, М. Грамыкі, В. Шашалевіча, В. Сташэўскага і інш. Ім уласцівыя праўда жыцця, гістарычная і жыццёва-бытавая канкрэтнасць. Нараджаецца гераіка-рэвалюцыйная Д., гістарычная, гісторыка-рэвалюцыйная Д. У 2-й пал. 20-х г. шырыцца тэматыка бел. Д. — Кастрычнік і грамадз. вайна, мірная праца, калектывізацыя, жыццё Зах. Беларусі і інш. Упершыню ствараюцца п'есы на рабочую тэму («Гута» Р. Кобеца, «Мост» Я. Рамановіча, «Качагары» І. Гурскага), якія адлюстроўваюць гераіку сацыяліст. буд-ва. Надзённасцю і вострай камедыйнасцю вызначаецца сатыр. камедыя Міровіча («Кар'ера таварыша Брызгаліна»). Плённа працуе ў жанрах меладрамы, сац.-бытавой камедыі і драмы У. Галубок («Плытагоны», «Пан Сурыпта», «Суд», «Ганка» і інш.), які паказвае дарэвалюц. бел. рэчаіснасць, бяспраўнае становішча чалавека працы ў эксплуататарскім грамадстве, уладу грошай і г. д. У 30-я г. спроба стварыць вобраз сучасніка, станоўчага героя спалучаецца з больш глыбокім пранікненнем у псіхалогію характару, дыялектыку чалавечай душы. У жанры драмы працуюць П. Глебка, Э. Самуйлёнак, З. Бядуля, М. Клімковіч і інш. Народна-рэвалюц. Д. піша Я. Колас («Вайна вайне»), К. Чорны ставіць глыбокія сац.-філас. і псіхал. праблемы («Бацькаўшчына», «Ірынка»). В. Вольскі ў вобразе Несцеркі (фальклорна-рамант. камедыя «Несцерка») увасобіў аптымізм народа, яго нязломны дух. Вялікае дасягненне бел. сав. Д. — драматургія К. Крапівы (гераіка-рэвалюц. драма «Партызаны», якая вызначаецца тонкім псіхалагізмам, народнасцю, спалучэннем гераічнага з гумарыстычна-сатырычным; п'есы «Проба агнём», «Пяюць жаваранкі» і інш.). Найб. майстэрства драматург дасягае ў жанры сатыр. камедыі («Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек»), дзе бязлітасна высмейваюцца кар'ерысты, падхалімы, прыстасаванцы, усе, хто хоча пядобрасумленна ўладкавацца ў жыцці. К. Крапіва стварае яркія, перакананчыя, па-мастацку дасканалыя характары. А. Маўзон («Канстанцін Заслонаў») і К. Губарэвіч («Брэсцкая крэпасць») праўдзіва ўзнаўляюць падзеі Вял. Айч. вайны, адлюстроўваюць гераізм бел. народа. Жыццё працоўных Зах. Беларусі паказана ў п'есах І. Козела («Папараць-кветка), В. Палескага («Калі зацвітаюць сады»). Пільнай увагаю да сучаснасці, майстэрствам востракамедыйнага сюжэту, своеасаблівасцю кампазіцыйнай пабудовы вылучаюцца п'есы А. Макаёнка («Выбачайце, калі ласка!», «Лявоніха на арбіце», «Трыбунал», «Зацюканы апостал»). Актуальныя праблемы гісторыі і сучаснасці асэнсоўваюцца ў драм. творах В. Віткі («Шчасце паэта»), І. Мележа («Пакуль вы маладыя»), І. Шамякіна («Выгнанне блудніцы»), А. Дзялендзіка («Выклік багам») і інш.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Об искусстве, т. 1—2, М., 1967 (гл. ў т. 2 Прадметны паказальнік); Аристотель. Об искусстве поэзии, М., 1957; Лессинг Г. Э. Гамбургская драматургия, [пер. з ням.], М.—Л., 1936; Гегель Г. В. Драматическая поэзия, Соч., т. 14, пер. с нем., М., 1958; Гюго В. Предисловие к «Кромвелю», Собр. соч., т. 14, пер. с франц., М., 1956; Белинский В. Г. О драме и театре. Избр. статьи и высказывания, М.—Л., 1948; Горький М. О литературе, М., 1953; Луначарский А. В. О театре и драматургии. Избр. ст., т. 1—2, М., 1958; Аникст А. Теория драмы от Аристотеля до Лессинга, М., 1967; Очерки истории русской советской драматургии, т. 1—3, Л.— М., 1963—68; Сахновский-Панкеев В. Драма. Конфликт. Композиция. Сценическая жизнь, Л., 1969; Семяновіч А. А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд). Мн., 1961; Ягож. Беларуская савецкая драматургія. 1917—1932, Мн., 1968; Сабалеўскі А. Беларуская савецкая драма, кн. 1, Мн., 1969; Няфёд У. Беларускі тэатр. Нарыс гісторыі, Мн., 1959; Крапіва К. Зб. твораў, т. 4, Мн., 1963; Ватацы Н. Б. Беларуская савецкая драматургія. Бібліягр., Мн., 1967.

М. Р. Ярош. Мінск.

ДРАМАТУРГІЯ (грэч. dramaturgia), 1) сукупнасць драматычных твораў якога-небудзь пісьменніка, народа, эпохі (драматургія А. Астроўскага, К. Крапівы, бел. драматургія, Д. Адраджэння). 2) Тэорыя пабудовы драматычнага твора. Гл. *Драма.*

ДРАМАТЫЧНАЯ СЕКЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ ГРАМАДЫ, створана ў Мінску ў кастр. 1919 з аматарскай моладзі. Працавала ў *«Беларускай хатцы»*. Кіраўнік С. Іваноў (Сымон Музыка); акцёры А. Ільінскі (Лапаць малодшы), А. Дудар, Гаротны, Сумная і інш. Ставіліся пераважна аднаактовыя п'есы: «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага, «Пасля смерці» і «На маскарад» Іванова, «Слуцкая варона» і «Мікітаў лапаць» М. Чарота, «Васількі» А. Паўловіча. У 1920 у сувязі з акупацыяй Мінска польскімі войскамі спыніла дзейнасць.

«ДРАНГ НАХ ОСТЭН» (ням. «Drang nach Osten» — «націск на Усход»), захопніцкая палітыка ням. феадалаў, пазней ням. ваенна-каланізатарскай дзяржавы Прусіі, юнкерска-буржуазнай і імперыял. Германіі ў дачыненні да краін Цэнтр., Усх. і Паўд.-Усх. Еўропы; таксама рэакцыйны лозунг і гістарычна-палітычная канцэпцыя, накіраваная на ідэалагічнае абгрунтаванне і апраўданне захопніцкай палітыкі.

Шырокае развіццё палітыка «Д. н. О.» набыла ў 12—13 ст. Ням. феадалы захапілі землі памаран, палабскіх славян і прыбалтыйскіх народаў. У завяванні іх антыўная роля належала каталіцкай царкве, якая прыкрывала агрэс. палітыку феадалаў лозунгам хрысціянізацыі язычнікаў. Рыцары *Тэўтонскага ордэна* спрабавалі ў 13 ст. заняволіць Русь, але былі ўшчэнт разбіты войскамі Аляксандра Неўскага (гл. *Лядовае пабоішча 1242*). Пасля паражэння на Чудскім воз. і пяўдалага паходу ў Прыбалтыку (пач. 50-х г. 13 ст.) Тэўтонскі ордэн накіраваў сваю агрэсію супраць Польшчы. У *Грунвальдскай бітве 1410* аб'яднаныя сілы рускіх, літоўцаў, палякаў, беларусаў і украінцаў перамаглі Тэўтонскі ордэн. З 17 ст. экспансію на У ажыццяўляла Брандэнбургска-Прускае дзяржава (з 1701 Прусія). З канца 19 ст. канцэпцыя «Д. н. О.» — важная састаўная частка знешнепалітычных дактрын герм. імперыялістаў. Яна выявілася ў праграмных установах і ў паліт. дзейнасці Пангерманскага саюза (шавіністычная арганізацыя найб. агрэсіўных элементаў герм. буржуазіі і юнкерства ў 1891—1939, якая выступала за сусв. панаванне імперыял. Германіі) і ў планах герм. генеральнага штаба. Канцэпцыю «націску на У» герм. імперыялізм шырока выкарыстоўваў у 1-ю сусв. вайну. Пасля перамогі Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. гэтая канцэпцыя набыла перш-наперш антысавецкі характар. Дапоўненая антыкамунізмам, самымі крайнімі формамі шавінізму і расізму, геапалітычнымі тэорыямі (гл. *Геапалітыка*), яна стала адной з гал. частак ідэалогіі і палітыкі герм. фашызму, адыграла важную ролю ў падрыхтоўцы і распальванні 2-й сусв. вайны 1939—45.

Разгром фаш. Германіі ў 2-й сусв. вайне, у якой гал. і вырашальнай была Вял. Айч. вайна Сав. Саюза 1941—45, азначаў поўны правал палітыкі «націску на У». Аднак стары лозунг «Д. н. О.» адраджаецца (у больш завуаляванай форме) рэваншысцкімі і мілітарысцкімі коламі ў ФРГ.

Літ.: «Дранг нах Остен» и историческое развитие стран Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы, М., 1967; «Дранг нах Остен» и историческое развитие народов Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы. (От эпохи раннего феодализма до конца XVIII в.). Проспект, т. 1, М., 1968; Германская экспансия в Центральной и Восточной Европе, пер. с польск., М., 1965.

А. Дз. Зубар. Мінск.

ДРАНІКІ (таркаваныя аладкі), традыцыйная беларуская страва. У таркаваную бульбу дадаюць соль, яйкі, муку. Пякуць на раслінным і жывёльным тлушчы, алеі, масло. Часам складваюць у гаршчок, заліваюць смятанаю і ставяць на лёгкі дух у печ. Ядуць з салодкім і кіслым малаком, смятанаю, скваркамі, мачанкаю.

ДРАПАВА, вёска ў Азярніцкім с/с Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны партызан». За 30 *км* на З ад Слоніма, 185 *км* ад Гродна, 1,5 *км* ад чыг. ст. Азярніца. 207 ж., гасп. 76 (1971). Клуб, б-ка.

ДРАПАЧЫ (драпакі, дзербакі), група с.-г. прылад для рыхлення, ачышчэння ад пырніку і інш. пустазелля верхняга пласта глебы. Драўляная трох- ці чатырохвугольная рама з жал. зубамі, ніжнія вострыя канцы іх раскляпаныя і выгнутыя ў форме лапак. На Беларусі існавалі на захадзе.

ДРАПЕЖНЫЯ ГРЫБЫ, мікраскапічныя грыбы, здольныя ўтвараць на грыбніцы лоўчыя кольцы ці інш. прыстасаванні, каб захопліваць здабычу — мікраскапічных нематод, інфузорый, амёб, жгуцікавых. Да Д. г. адносяцца грыбы родаў Arthrobotrys, Dactylella, Trichothecium і інш.

Кольцы з клетак, укрытых клейкаю масаю, маюць уласцівасць імгліва набракаць і сціскаць цела нематоды. З дапамогаю ферментаў Д. г. раствараюць абалонку захопленай ахвяры, прапускаюць у сярэдзіну яе цела свае парасткі, якія паступова ператвараюцца ў добра развіты міцэлій. Пры адсутнасці нематодаў Д. г. жывяцца, як звычайныя сапрафіты, пераважна раслінымі рэшткамі. Д. г. можна выкарыстоўваць для біял. спосабу барацьбы з фітапатагеннымі нематодамі (галавая, бульбяная, рысавая, сунічная), а таксама з нематодамі, патагеннымі для чалавека і жывёл.



Умярцвенне нематоды драпежным грыбам з роду Trichothecium.

Літ.: Хохряков М. К. Вредные и полезные грибы, 2 изд., Л., 1969.

В. М. Прусакова. Мінск.

ДРАПЕЖНЫЯ ЗВЯРЫ (Carnivora), атрад млекакормячых падкл. плацэнтарных. 7 сям. (віверавыя, каціныя, гіенавыя, сабачыя, мядзведзевыя, куніцавыя, янотавыя). Пашыраны ва ўсім свеце, акрамя Антарктыкі. У фаўне СССР 6 сям. (няма віверавых), на Беларусі 5 (акрамя гіенавых), янотавыя акліматызаваны.

Даўж. Д. з. ад 20 *см* (ласка) да 3 *м* (белы мядзведзь), маса адпаведна ад 100 *г* да 700 *кг*. Зубы падзяляюцца на разцы, вялікія конусападобныя выгнутыя іклы і карэнныя (сярод апошніх ёсць драпежныя зубы). Усе віды звяроў драпежнікі, радзей усядныя, вельмі рэдка наслкомаедныя ці раслінаедныя. Пераважна наземныя жывёлы: *барсук, ліс* жывуць у норах, *воўк* і інш. — у логавах. У некат. *(выдра)* паўводны спосаб жыцця, іншыя *(куніцы, рысь)* лазяць па дрэвах. Большасць Д. з. — аб'ект промыслу. Ёсць шкодныя жывёлагадоўлі і паляўнічай гасп. Гл. таксама *Барс, Гарнастай, Дынга, Каланок, Леапард, Леў, Мядзведзь, Норкі, Пясец, Расамаха, Тхары, Тыгр, Хахуля, Чаротавы кот, Чырвоны воўк, Шакал, Ягуар, Янотападобны сабака, Янот-паласкун.* Іл. гл. на ўклейцы.

Літ.: Млекопитающие Советского Союза, т. 2, ч. 1, М., 1967; Сержанин И. Н., Сержанин Ю. И. и Слесаревич В. В. Определитель млекопитающих Белоруссии, Мн., 1967.

І. М. Сяржанін. Мінск.

ДРАПЕЖНЫЯ ПТУШКІ (Accipitres, Falconiformes), атрад птушак. Вядома каля 270 відаў, аб'яднаных ў 2 падатрады: сапраўдныя (нармальныя) Д. п. (сям. сакаліных, ястрабіных, скопаў, афр. сакратароў) і амер. грыфы. Пашыраны Д. п. на ўсіх мацерыках, акрамя Антарктыды. У СССР 44 віды (сям. сакаліных, ястрабіных, скопаў), на Беларусі 24 (сям. сакаліных і ястрабіных; найб. шматлікія звычайны канюк і чорны каршун, гл. *Канюкі, Каршуны*).

Даўж. Д. п. ад 15 *см* да 1 *м*. Самкі большыя за самцоў. Маюць кручкаватую дзюбу, вострыя загнутыя кіпцюры, шчыльнае яркае апярэнне, добра развіты слых і зрок, дужыя ногі і грудныя мышцы. Гнёзды Д. п. пераважна на дрэвах. Нясуць 1 (*змеяед*) — 6—7 (*перапёлачнік*) яец. Пералётныя, вандроўныя ці аселыя птушкі. Актыўныя ўдзень. Кормяцца наскомымі, рыбаю, земнаводнымі, паўзунамі, птушкамі, млекакормячымі, мярцвячынай; некат. віды пэўным кормам (*асаед* — лічынкамі восаў, сокал-сапсан, *дзербнік, ястрабы* — птушкамі). Многія віды карысныя: знішчаюць шкодных грызуноў, непаўнацэнных і хворых жывёл — пераносчыкаў узбуджальнікаў хвароб (фактар натуральнага адбору). Сокал-сапсан,

беркут, ястрабы выкарыстоўваюцца на паляванні. Некат. Д. п. *(балотны мышалоў*, чорны каршун) нападаюць на свойскіх і дзікіх вадаплаўных птушак. Іл. гл. на ўклейцы.

Літ.: Галушин В. М. Хищные птицы, М., 1970; Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Жизнь животных, т. 5, М., 1970. *Б. З. Галадушка.*

ДРАСЁН (Polygonum), род. адна- і шматгадовых траў і паўкустоў сям. грэчкавых. Вядома 200 відаў, пашыраных у краінах умераных і субтрапічных шырот. У СССР каля 160 відаў, на Беларусі 15.



Драсён вмяліны: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка; *3* — плод.

Сцябло прамастойнае распасцёртае або павойнае, выш. да 1 *м*. Лісце з раструбам каля асновы чаранка. Кветкі дробныя ў пазушных пучках, адзіночныя або ў коласападобных суквецціях. Плод — сціснуты ці трохгранны арэшак. Расце на вільготных лугах, каля канаў, рэк, у пасевах. Сярод відаў Д. дубільныя і лекавыя расліны — Д. перцавы *(вадзяны перац)*, Д. змяіны, ракавыя шыйкі (P. bistorta, нар. назвы: вобарацень, рачыкі, вяжоўнік), Д. звычайны (P. persicaria, нар. назвы: герчак, гусятнік дзікі); пустазелле — Д. павойны (P. convolvulus, нар. назвы: грачышка, бералёзка, павойка), Д. птушыны, спарыш (P. aviculare, нар. назвы: зерніца, гусятнік, свінуха), Д. шурпаты (P. scabrum, нар. назвы: дзердзец, дрост белы), Д. ільняны (P. linicola). Насенне Д. ўсходжае 5—7 гадоў, у страўніку жывёл не пераварацца. Меры барацьбы: правільная агратэхніка, ачыстка насення, угнойванне глебы толькі добра перапрэлым гноем. Д. востраканцовы і Д. сахалінскі вырошчваюць як дэкаратыўныя і сілосныя культуры. Д. звычайны атрутны для жывёлы.

Літ.: Котт С. А. Сорные растения и борьба с ними, М., 1969. *Г. А. Кім.* Мінск.

ДРАЎЛЯНАЕ ДАПЛІДСТВА, від архітэктуры, якому ўласцівыя адзінства будаўнічага матэрыялу (дрэва) і спецыфічныя канструкцыі (гл. *Драўляныя канструкцыі*); мастацтва ствараць дамы і збудаванні з дрэва, арганічна спалучаючы рашэнне функцыянальных, канструктыўных і мастацкіх задач. Дрэва здаўна было буд. і аздобным матэрыялам дзякуючы сваёй трываласці, малой аб'ёмнай вазе, нізкай цеплаправоднасці, лёгкасці апрацоўкі (найб. ранніх — пабудовы на палях эпохі неаліту). Асаблівая эстэт. выразнасць у Д. д. дасягалася спалучэннем простых геам. формаў (у аснове якіх ляжыць модуль, роўны даўжыні бервяна ці адзінцы вымярэння — сажню, аршыну), а таксама разьбой, што адцяняе прыгажосць фактуры драўніны, якая з цягам часу цямнее. Кампазіцыйныя прыёмы, выпрацаваныя Д. д., уздзейнічалі на мураваную архітэктуру.

У старадаўнім дойлідстве і ў сучасным буд-ве асн. канструктыўныя сістэмы Д. д.: зруб (з бярвенняў, звязаных урубкамі па вуглах і гарызантальна паложаных адно на адно) і каркас з стоек, бэлек, раскосаў (нясучыя элементы) і запаўняльнікаў (агараджальныя элементы). Як прыклад — цэрквы з запаўняльнікамі з верт. пласцін у Нарвегіі (н. у Урнесе, 11—12 ст., у Боргуне, 12 ст.) ці старадаўнія храмы і палацы Японіі і Кітая. Сярод пакрыццяў пашыраны вяликовыя (з пакладзеных адзін на адзін радоў бярвенняў, якія ўкарочваюцца ўгору) і крокленныя канструкцыі. Зрубныя культавыя будынкі на тэр. СССР (пашыраны ў рус., укр. і бел. Д. д.) маюць адзін, два ці тры прамавугольныя зрубы, васьмярык (у камбінацыі з прамавугольнымі прыбудовамі, а на Украіне меншы васьмярык ці пяцігранны зруб). Пакрыццё рус. цэркваў: двухсхільнае (Лазараўская ц. з Мурамскага манастыра, канец 14 ст.; знаходзіцца ў Кіжах), шатровае (Панілава, 1600), кубаватае (Кушарэцкае, 1669), ярус (Таржок, 1653) і шматгаловае (Кіжы: ц. Праабражанская, 1714, і Пакроўская, 1764). На Украіне былі пашыраны невысокія шатры (Драгобыч, 1600), крывалінейныя васьмігранныя дахі, часта надзеленыя на ярусы (Новамаскоўск, 1772—79; Крыўкова, 1763, уваходзіць у Львоў). Крапасныя збудаванні асталіся пераважна ад 17 ст. (Якуцкі астрог, 1683), нар. жыллё ад больш позняга часу (канец 18—19 ст.). Адпак дзякуючы павольнай эвалюцыі сельскага жылля яно не страціла старадаўніх буд. традыцый і вызначаецца прастатой планіроўкі, рацыянальнымі канструкцыямі і стрыманым дэкорам. Аснова жылля — чатырох-пяцісценны зруб ці некалькі злучаных зрубаў, накрытых двух- ці шматсхільным дахам. Найб. маст. цікавасць мае жыллё паўн. абласцей РСФСР, дзе жыллё і двор размяшчаюцца на высокім падклецці над адным дахам.

На тэр. Беларусі раннія драўляныя пабудовы адносяцца да часоў палеаліту, у эпоху неаліту і ў бронзавым веку пашыраны пабудовы на палях (воз. Ула і інш.), паўзямлянкі і зямлянкі, зрубныя збудаванні. Дрэвам як асн. буд. матэрыялам шырока карысталіся ў забудове гарадоў і вёсак да 19 ст. Дрэва ішло на крэпасці, замкі, храмы, ратушы, корчмы, жылыя і гасп. збудаванні. На працягу стагоддзяў у Д. д. Беларусі склаліся кампазіцыйныя прыёмы, адпаведныя бытавым патрэбам і маст. густам народа. Зрубнае нар. жыллё Беларусі характарызавалася аднакамернымі, двухраздзельнымі, трохраздзельнымі і складанымі дамамі (хатамі) з простым і сціплым дэкорам, з разнастайнымі па форме і канструкцыях дахамі (гл. *Жыллё*). Асн. тыпы культавага Д. д. 17—18 ст.: адназрубныя храмы з алтарным прырубам (Жыровічы), трохзрубныя храмы з глыбінна-прастаравай будовай (Давыд-Гарадок), пяцізрубныя храмы з пірамідальна-цэнтрычнай будовай (Слуцк). Храмы завяршаліся шатрамі, купаламі, галоўкамі. У цэрквах і шмат'ярусных званіцах (стаялі звычайна асобна ад храма) выкарыстоўваліся рацыянальныя і эканамічныя канструкцыі. Драўляныя касцёлы 17—18 ст. будаваліся пад непасрэдным уплывам архітэктуры мураваных вежавых касцёлаў (Мядзел). Уніяцкія драўляныя храмы (18 ст.) архітэктурай падобныя на праваслаўныя драўляныя цэрквы. Але ўзнікаюць і тыпы уніяцкіх храмаў (Дудзічы), падобныя на касцёлы. У буд-ве драўляных сінагог 18 ст. (Гродна, Воўпа, Нароўля) выкарыстоўваўся шэраг маст. формаў і канструкцый, пашыраных у жыллёвым і грамадз. буд-ве. Значна палепшаная якасць драўніны (антысептаванне і прасаванне) і ўжыванне асабліва трывалага клею на змацаванне драўляных элементаў пашырылі выкарыстанне дрэва ў цяперашнім буд-ве (у СССР пераважна ў сельскім). Маст. традыцыі Д. д. мінулага творча развіваюцца, узнікаюць новыя кампазіцыйныя і канструктыўныя прыёмы, новыя маст. формы, прыпа-



Драпежныя звяры. 1. Белы мядзведзь. 2. Пясец. 3. Куніца лясная. 4. Янот-паласкун. 5. Янотападобны сабака. 6. Тыгр. 7. Норка. 8. Собаль (баргузінскі). 9. Рысь. 10. Леў. 11. Каланок. 12. Ласка. 13. Ліс.



Драпежныя птушкі.
1. Чорны каршун.
2—3. Ястрабы (2 — перапёлачнік, 3 — цецяроўнік).
4. Сокал-сапсан.
5. Кондар.
6. Сакратар.
7. Чорны грыф.
8. Кобчык.
9. Балобан звычайны.
10. Лунь палявы.
11. Скапа.

цыны афармлення інтэр'ераў і інш. Дрэва сталі ў поснехам выкарыстоўваць у буд-ве вял. грамадскіх і прамысл. будынкаў як матэрыял для арак, рам, купалоў, абалонак і інш. Іл. гл. на ўклейцы.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968 (бібліягр.); Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969; Лисенко Л. М. Гармонические построения в архитектуре церквей Кижского погоста, у зб.: Архитектурное наследство, № 18, М., 1969.

Л. М. Лісенка. Масіва; *У. А. Чантурыя* (беларускае драўлянае дойлідства). Мінск.

ДРАЎЛЯНЕ, адно з племянных аб'яднанняў усх. славян у 8—10 ст. Стараж. назва «дрэўлі» паходзіць ад месцовасці, дзе яны жылі — у дрымучых лясах на правабярэжжы Прыпяці, на цячэнні рэк Цецераў, Уж, Убарць, Сцвіга. На У межавалі з *палянамі*, на З з *валынянамі* і *бужанамі*, на Пн з *дрыгавічамі*.

Тэр. Д. у асноўным супадае з тэр. слав. помнікаў пражскай культуры (6—8 ст.). Археал. помнікамі Д. 9 ст. з'яўляюцца курганы з трупаспаленнем (з канца 10 ст. з трупаналажэннем). Д. жылі ў паўземлянках, займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, ганчарствам, ткацтвам, апрацоўкай жал. руды. Гарады будавалі на высокіх, цяжкадаступных месцінах: Уручый (сучасны Овруч), Горадск каля г. Карастышава, гарадзішча каля г. Маліна і інш. Гал. горадам быў Іскарасцень (сучасны Корасцень), тут жыў князь і старэйшыны з месцовай родавай знаці. У 9—10 ст. у Д. было сваё палітычнае аб'яднанне — «княжанне», якое пазней наз. «Деревьска земля». Князі імкнуліся захаваць незалежнасць ад Кіева, аднак у 883 кіеўскі кн. Алег прымусіў Д. плаціць яму даніну. У 907 у складзе кіеўскага войска удзельнічалі у паходзе на Візантыю. Пасля смерці Алега хацелі адасобіцца ад Кіева, нават перасталі плаціць даніну. Кн. Ігар наважыўся зноў надзарадкаваць Д., але быў забіты у 945 на загадзе князя драўлян Мала. Ігарава жонка кн. Вольга жорстка расправілася з Д.— спаліла іх гарады і вынішчыла знаць. Тэр. Д. стала ўдзельным княствам з цэнтрам у г. Уручый і была канчаткова далучана да Кіева. Племянная назва Д. апошні раз узгадваецца пад 1136, калі кіеўскі кн. Яраполк надараваў іх зямлю Дзесяцінай царкве ў Кіеве.

Літ.: Брайчевський М. Ю. Походження Русі, Київ, 1968; Третьяков П. Н. Восточнославянские племена, 2 изд., М., 1953; Русанова И. П. Территория древлян по археологическим данным, «Советская археология», 1960, № 1.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

ДРАЎЛЯНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ, будаўнічыя канструкцыі, зробленыя поўнасцю ці пераважна з драўляных матэрыялаў. Ужываюцца (у раёнах, багатых на лес) у жыллёвых і грамадскіх будынках, мастах, апорах ліній перадач, невялікіх плацінах, вежах, с.-г. будынках і збудаваннях. Найбольш эфектыўна выкарыстоўваюцца ў розных збудаваннях з хімічна агрэсіўным асяроддзем, дзе Д. к., асабліва клееныя, у шэрагу выпадкаў больш даўгавечныя за жалезабетон і метал (напр. Д. к. складаў сільвініту на Салігорскіх калійных камбінатах).

Д. к., а таксама сталярныя вырабы атрымліваюць з сухой драўніны вільготнасцю не больш як 8—15%. Па прызначэнні падзяляюцца на агарадзальныя і нясучыя. Агараджальныя (сцены, перакрыцці, пакрыцці) робяць суцэльнымі (зрубы), нарэбнымі і шчытавымі з запаўненнем вогнетрывалымі і ўстойлівымі сумяшчэннем матэрыяламі (мінер. ватай і інш.). Агараджальныя канструкцыі часта выконваюць нясучыя функцыі. Нясучыя Д. к. падзяляюцца на плоскія і прасторавыя. Плоскія бываюць суцэльныя (бэлькі, аркі) і сквазныя (фермы, рамы). Лесаматэрыялы (бярвенне, брусы, дошкі) шырока выкарыстоўваюцца як бэлькі, прагоны, насцілы; утвараюць вял. групу найпрасцейшых суцэльных канструкцый. З вялікапралётных нашараны клееныя канструкцыі, у т. л. аркі і фермы з метал. вацяжкамі, клееныя бэлькі, металадраўляныя фермы з брусоў і састаўных бэлек з метал. расцягнутым поясам. Драўляныя абалонкі найчасцей выкарыстоўваюцца як пакрыцці летніх тэатраў, выставачных павільёнаў, складскіх будынкаў і інш. Склейваюць канструкцыі водаўстойлівымі клеямі, напр., фенолфармальдэгідным. Да спец. тыпаў прасторавых канструкцый належаць масты, эстакады, вежы. Д. к. адровніваюць таксама на відах злучэння элементаў на клеі, урубках, нагелях, шпонах. Перспект. Д. к. заводскага вырабу: клееныя і клеефанерныя, зборныя элементы будынкаў і інш. Шырока ўжываюцца ў буд-ве *драўняна-валакністыя пліты* і *драўняна-стружкавыя пліты*. Каб павысіць вогнеўстойлівасць і засцерагчы ад загнівання Д. к., ужываюцца канструкцыйныя і хім. меры аховы: тынкоўка, абліцоўка негаручымі ці цяжкагаручымі матэрыяламі. Драўніну прапітваюць вогнезасцерагальнымі саставамі (антыпірэнамі) і укрываюць Д. к. вогнезасцерагальнымі фарбамі ці абмазкамі. Развіццё вытворчасці канструкцый з жалезабетону і інш. матэрыялаў паменшыла удзельную вагу Д. к. у буд-ве. Гл. таксама *Драўлянае дойлідства*.

Літ.: Деревянные конструкции, 3 изд., М., 1961; Ветрюк И. М. Конструкции из дерева и пластмасс, Мн., 1968; Свенцицкий Г. В. Деревянные конструкции, М., 1962; Иванова Е. К. Применение клееных деревянных конструкций за рубежом, М., 1968.

Л. С. Караічаў. Мінск.

ДРАЎНІНА, ксілема (ад грэч. xýlon дрэва), тканка раслін, складаецца з клетак з адрэўнелымі абалонкамі. Надае расліне трываласць, праводзіць ваду з растворанымі ў ёй рэчывамі і часта з'яўляецца месцам назапашвання пажыўных рэчываў.

Асн. анат. элементы Д.— сасуды (*трахеі*), *трахеіды*, драўняныя валокны (лібрыформ) і драўняная паренхіма. Адровніваюць Д. першасную, якая утварылася клеткамі пракамбію (першасная утваральная тканка), і другасную (уласна Д., якую прынята разумець як лясны матэрыял), што утварылася *камбіем*. У драўных раслін Д.— асн. частка сцябла, галін, караня і знаходзіцца намі стрыжнем і камбіем. У большасці травяністых раслін Д. размяшчаецца ў унутр. боку сасудзіста-валакністых пучкоў. Клеткі Д., што утварыліся за вясну, лета і восень, складаюць слой — гадавое кольца прыросту. У слоі адрозніваюць ранюю, або веснавую, Д. (утвараецца у 1-й палове вегет. перыяду і мае вял. таннасценныя клеткі), і позняю, або летнюю (утвараецца ў больш позні перыяд і складаецца з дробных тоўстасценных клетак). Мяжа намі гадавымі кольцамі у многіх дрэў добра відаць, таму можна вызначыць узрост дрэва. У большасці раслін у Д. сцябла адначасова з абалону — філагенетычна антыўную частку (праводзіць ваду і мінер. рэчывы) і ядро або сэрцавіну (удзельнічае у водазабеспячэнні; у некат. парод у клетках не назапашваюцца смолы, дубільныя рэчывы, алей, камедзі, пігменты). Д. у асноўным даюць хвойныя пароды (хвоя, піхта, ёлка і інш.), лісцевыя (дуб, бук, таполя, ясень і інш.). Элементны састаў сухой Д. розных парод падобны, у ім 49,4—50,2% вуглероду, 6,1—6,9% вадароду, 43,6—45,2% кіслароду і 0,9—1,3% азоту. Попелу ад 0,2 да 1,2%, на мінер. саставе ён складаецца пераважна (75—90%) з нерастваральных у вадзе вугляшчолачных соляў кальцыю, крэмніевых і фосфарнакіслых соляў магнію і жалеза і з невял. колькасці (10—25%) растваральных соляў — паташу і соды. Д. розных парод складаецца у асн. з цэлюлозы, геміцэлюлоз (гексаванаў і пентаванаў) і лігніну. У хвойнай Д. цэлюлозы 48—50%, лігніну 26—30 і геміцэлюлоз 23—26%; у лісцевай — цэлюлозы 46—48%, лігніну 19—28 і геміцэлюлоз 26—35%. Шчыльн. Д. мяняецца у шырокіх межах у залежнасці ад віду раслін і умоў іх росту, напр., у сярэднім шчыльн. хвойнай Д. 480 кг/м³, лісцевай — 620 кг/м³. Каб павялічыць вільгацеўстойлівасць, стабільнасць і бінтрываласць Д., не насычаюць сінт. смоламі, маслам і інш. Вогнетрываласць Д. надаюць апрацоўка антыпірэнамі ці спец. пакрыцці.

Д. шырока карыстаюцца ва ўсіх галінах нар. гаспадаркі (будаўніцтве, машынабудаванні, мэблевай і гарнарудпай прамысл. і інш.). Ідэа Д. на вытворчасць *цэлюлозы, кардону, паперы, драўнінавалакністых пліт, драўніннастружкавых пліт, фібраліту* і інш., а таксама на паліва. З яе робяць *драўляныя канструкцыі*. Хім. перапрацоўкай (*гідролізам, сухой перагонкай драўніны*, энергахім. перапрацоўкай і інш.) з Д. атрымліваюць *дубільныя рэчывы*, каніфоль, шкіпінар, флатамасла, харч. глюкозу, драўняны і вінны спірт, штучнае валакно і інш. (гл. таксама *Асмол, Драўняныя пластыкі*).

Літ.: Никитин Н. И. Химия древесины и целлюлозы, М.—Л., 1962; Вихров В. Е. и Лобасенок А. К. Технические свойства древесины в связи с типами леса, Мн., 1963; Перелыгин Л. М. Древесиноведение, 2 изд., М., 1969.

А. С. Самцоў, А. І. Скрыган. Мінск.

ДРАЎНІННАВАЛАКНІСТАЯ ПЛІТА, цеплагукаізаляцыйны і канструкцыйны драўняны будаўнічы матэрыял. Асн. кампанент для вырабу Д. п.— здробненая пядзелавая драўніна, а таксама салома, адходы бавоўны, кастрыца. Валакністая маса змяшчае эмульсіі, сінт. смалу і інш. дамешкі, якія надаюць плітам водаўстойлівасць і трываласць. Пліты фармуюць на адліваючых машынах, прасуюць на гарачых прэсах і сушаць. Адрозніваюць звышцвёрдыя, цвёрдыя, паўцвёрдыя, ізаляцыйнааддзелачныя і ізаляцыйныя Д. п. Даўж. пліт 1200—3600 *мм*, шыр. 1000—1800, таўшч. 3—25 *мм*. На Беларусі Д. п. выпускаюць Віцебскі дрэваапр. камбінат, Навабеліцкі лесахім. к-т, Барысаўскі і Бабруйскі фанера-запалкавыя камбінаты.

Літ.: Солечник Н. Я. Производство древесноволокнистых плит, 2 изд., М., 1963; Дроздов И. Я. и Кунин В. М. Производство твердых древесноволокнистых плит, М., 1970.

ДРАЎНІННАСТРУЖКАВАЯ ПЛІТА, штучны матэрыял у выглядзе пліт, атрыманы гарачым прасаваннем сумесі здробненай драўніннай стружкі з сінт. смоламі. Адрозніваецца ад драўніны (матэрыялу анізатропнага) адпаловкавымі ўласцівасцямі ў любым напрамку плоскасці пліты. Вырабляюцца адна- і шматслаёвыя. На пліты ідуць адходы дрэваапрацоўкі, пядзелавая драўніна розных парод, адходы с.-г. вытворчасці (рысавая салома, ільняная кастрыца), чарот. Шыр. пліт да 1800 *мм*, даўж. да 3600 (пры перарыўным спосабе вытворчасці неабмежаваная), таўшч. ад 6 да 75 *мм*. Адрозніваюць лёгкія, паўцяжкія і цяжкія Д. п. Пашыраны ў вытворчасці мэблі, у буд-ве, судна- і вагонабудаванні. На Беларусі Д. п. выпускаюць Віцебскі дрэваапр. камбінат, Пінскі і Гомельскі фанера-запалкавыя к-ты, Мазырскі дрэваапрацоўчы к-т.

Літ.: Шварцман Г. М. Производство древесностружечных плит, 2 изд., М., 1967.

ДРАЎНЯНЫ СПІРТ, тое, што *метылавы спірт*.

ДРАЎНЯНЫЯ ПЛАСТЫКІ, матэрыялы, якія атрымліваюць п'езатэрмічнай апрацоўкай натуральнай ці мадыфікаванай (суцэльнай, ліставой ці здробненай) драўніны з дабаўленнем або без дабаўлення звязвальных ці інш. рэчываў.

У залежнасці ад якасці драўніны, ад звязвальных рачываў і тэхналогіі вытворчасці выпускаюцца прасаваная драўніна, драўняныя слаістыя пластыкі, кампазіцыйныя драўняныя пластыкі, драўніннастружкавыя і драўнінавалакністыя пліты, п'езатэрмапластыкі і інш. Ужываюцца як канструкцыйны матэрыял у машына-, прылада,- судна- і самалётабудаванні, у рамонтнай справе, у мэблевай прамысл., для насцілкі падлогі і г. д., замяняючы з добрым эканам. эфектам чорныя і каляровыя металы, каштоўныя пластмасы, суцэльную драўніну. У БССР Д. п. вырабляюць у Мінску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску, Пінску, Барысаве, Мазыры, Мастах, Рэчыцы.

Літ.: Нысенко Н. Т. Древесные пластмассы (технология, свойства и применение), М., 1964; Минин Л. Н. Технология пьезотермопластиков, М., 1965.

А. М. Мінін. Мінск.

ДРАХМА (грэч. drachmḗ), 1) грашовая адзінка Грэцыі, дзеліцца на 100 лептаў. Па водле афіц. курсу Дзяржбанка СССР на 3.8.1971 100 Д.=3,01 руб. 2) Сярэбраная грашовая адзінка Ст. Грэцыі (з 6 ст. да н. э.).

ДРАЧ, дзяркач (Crex crex), птушка сям. пастушковых атр. пастушкоў. Пашыраны ў Еўропе, Зах. Азіі. На Беларусі (пар. назвы: дзяргач, дзяргун) ва ўсіх раёнах.



Даўж. цела птушкі да 25 см, маса каля 150 г. Пералётная. Гняздуецца на вільготных лугах і травяністых лясных палянах. Гнёзды робіць на зямлі. Нясе 9—10 яец. Корміцца насякомымі, смаўжакамі, даждажавымі чарвякамі, насеннем пустазелля і культ. раслін. Палявое значэнне невялікае.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ДРАЧКАВА, вёска ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., каля р. Вожа (1 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Загор'е». За 26 *км* на Пд ад Смалявіч, 40 *км* ад Мінска, 27 *км* ад чыг. ст. Смалявічы, на шашы г. Смалявічы — г. п. Смілавічы. 705 ж., гасп. 230 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, урачэбная амбулаторыя, аддз. сувязі, швейн. і шавецкая майстэрні, сталовая, 4 магазіны.

ДРАЧОЎ Карп Міхайлавіч [н. 1(13).10.1897, в. Казловічы Горацкага пав. Магілёўскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1927. У 1927—41 на сав. рабоце. У партызанах з жн. 1941 — палітрук роты, камісар і камандзір атрада. З вер. 1943 камісар *партызанскай брыгады 10-й Журавіцкай* Гомельскай вобл. У 1943—58 старшыня Рагачоўскага райвыканкома, дырэктар саўгаса «Рагачоўскі». Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Рагачове.

ДРОБЫ, лікі, якія складаюцца з цэлай колькасці роўных доляў адзінкі.

Запісваюцца ў выглядзе $\frac{p}{q}$, дзе лічнік p паказвае колькасць узятых доляў адзінкі, падзеленай на столькі доляў, колькі пакавае назоўнік q. Лічнік і назоўнік наз. членамі Д. Пры $p > q > 0$ Д. наз. няправільнымі, пры $0 < p < q$ — правільнымі. Няправільны Д. можна запісаць як суму цэлага ліку і правільнага Д.: $\frac{7}{3} = 2 + \frac{1}{3} = 2\frac{1}{3}$. Лічнік і назоўнік Д. можна памнажыць (падзяліць, калі яны маюць агульны дзельнік) на адзін і той жа лік, і велічыня Д. пры гэтым не зменіцца. Каб скласці (адняць) Д. з адпаловкавымі назоўнікамі, трэба скласці (адняць) лічнікі і пакінуць той жа назоўнік: $\frac{n}{m} + \frac{k}{m} - \frac{l}{m} = \frac{n+k-l}{m}$. Пры складанні (адніманні) Д. з рознымі назоўнікамі іх прыводзяць да агульнага назоўніка. Множаць і дзеляць Д. па правілах $\frac{a}{b} \cdot \frac{c}{d} = \frac{a \cdot c}{b \cdot d}$, $\frac{a}{b} : \frac{c}{d} = \frac{a \cdot d}{b \cdot c}$. Гл. таксама *Дзесятковы дроб, Неперарыўны дроб*.

ДРОЖДЖЫ, мікраскапічныя адноклетачныя бесхларафільныя грыбы. Клетка Д. шарападобнай, эліптычнай або цыліндрычнай формы, памерам 2—20 *мкм*. Падаляюцца на сапраўдныя Д. (аскаміцэты), якія ўтвараюць споры, і несапраўдныя (аспарагенныя), якія спораў не ўтвараюць. Сапраўдныя Д. здольныя развівацца як у аэробных, так і ў анаэробных умовах, у апошнім выпадку яны атрымліваюць энергію ў выніку спіртавога браджэння. Сярод несапраўдных Д. ёсць аблігатныя аэробы, не здольныя да браджэння.

Д. вельмі пашыраны ў глебе, на паверхні раслін. Размнажаюцца пераважна пачкаваннем. Пераносяцца ветрам і насякомымі. Шырока выкарыстоўваюцца ў піваробстве, піваварэнні, хлебапячэнні, пры вытворчасці спірту, гліцэрыны, а ў сімбіёзе з малочнакіслымі бактэрыямі — кісламалочных прадуктаў (кефіру, кумысу і інш.). Д. багатыя на вітаміны (асабліва групы В) і ўжываюцца ў медыцыне пры лячэнні авітамінозаў, фурункулёзу, дыспепсіі і інш., а таксама ідуць на выраб канцэнтратаў вітамінаў B_1, B_2 і PP. Шырока ўжываюцца Д. як кармавы сродак — канцэнтрат бялку і вітамінаў для кармлення с.-г. жывёл. У вытворчасці кармавых Д. выкарыстоўваюць адходы харч. вытворчасці, гідралізаты драўніны, парафіны нафты, газападобныя вуглевадароды. Пры гэтым ужываюць пераважна аспарагенныя Д., здольныя хутка расці ва ўмовах аэрацыі. Некат. віды Д. выкарыстоўваюцца пры вырабе тлушчу, караціну, эргастэрыну і інш. У СССР для вытворчасці дражджавых прадуктаў створана спецыяльная галіна прамысловасці.

Літ.: Кудрявцев В. И. Систематика дрожжей, М., 1954; Успехи технической микробиологии (дрожжи и их метаболиты), Мн., 1968; Малков А. М. Технология хлебопекарных и кормовых дрожжей, М., 1962.

М. В. Залашка. Мінск.

ДРОЗД Валянцін Пятровіч [3(16).9.1906, ст. Кашалёва (Буда-Кашалёва) Магілёўскай губ.— 29.1.1943], віцэ-адмірал. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1930. У Чырв. Арміі з 1925. Скончыў вышэйшае Ваен.-марск. вуч. імя Фрунзе (1928). З 1928 на Балт., потым на Паўн. флоце на камандных пасадах. Удзельнік баёў у Іспаніі, сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну караблі Балт. флоту пад камандаваннем Д. зрабілі пераход з Таліна ў Кранштат, у шторм ноччу прайшлі мінныя палі, выратавалі і пераправілі на Ленінградскі фронт абарончаў п-ва Ханка. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі. Імем Д. названы карабель на Паўн. флоце, вуліца ў Буда-Кашалёве.



Літ.: Голичников В. Два героических похода. У кн.: Балтийцы, М., 1955.

ДРОКАЎКА, вёска ў Прудкоўскім с/с Чавускага р-на Магілёўскай вобл., на р. Каменка. Цэнтр калгаса імя Леніна. За 16 *км* на ПдУ ад Чавусаў, 64 *км* ад Магілёва, 20 *км* ад чыг. ст. Чавусы, каля шашы Чавусы — Чэрыкаў (3 *км*). 244 ж., гасп. 97 (1971). Пач. школа, клуб, магазін. У 1943 вёску спалілі нямец.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ДРОНТЫ (Raphidae), вымерлае сямейства птушак атр. галубоў. Былі пашыраны на Маскарэнскіх а-вах.



Дода.


У сям. 3 віды. Адзін з іх Raphus cucullatus — уласна Д., дода (па-партуг. дурань) велічынёй з гусь, зверху цёмна-бury, знізу светлаваты, крылы і хвост недаразвітыя, белыя з плямкамі. Прыстасаваўшыся да жыцця на астравах (в-аў Маўрыкій), дзе не было драпежнікаў, ён страціў здольнасць лятаць. З асваеннем астравоў еўрапейцамі (1558) вынішчаны паляваннем і завезенымі туды свойскімі свінямі. Апошняе паведамленне пра ўласна Д. датуецца 1681. У некат. музеях (Оксфард, Капенгаген, Масква) абярагліся толькі асобныя часткі цела доды. Другі від — пустынnік (Pezophaps solitaria), апісаны ў канцы 17 ст., жыў на в-ве Радрыгес. Абставіны гібелі невядомыя. Трэці від. Д. Raphus apterornis жыў на в-ве Рэюньён. Вымер прыкладна ў сярэдзіне 18 ст.

Літ.: Руководство по зоологии, т. 6, М.—Л., 1940.

М. С. Долбік. Мінск.

ДРОСЕЛЬ (ням. Drossel), 1) прыстасаванне, якое звужвае паток вадкасці, пары ці газаў у трубапаводах. Ужываецца для вымярэння і рэгулявання ціску і расходу гэтых рэчываў (дросельныя расходамеры, дыяфрагмы, соплы і інш.), а таксама для рэгулявання гаручай сумесі ў рухавіках унутр. згарання (дросельныя клапаны, засланкі). 2) Шпуля з вял. індуктыўным супраціўленнем. Ужываецца ў электратэхнічных і радыётэхнічных апаратах. Гл. *Індуктыўнасці шпуля*.

ДРОФЫ (Otidiformes), атрад птушак. 24 віды. Пашыраны ў Афрыцы, Еўропе і Азіі, 1 — у Аўстраліі. У СССР 3 віды. Два з іх — стрэпет (Otis tetrax) і ўласна Д. (O. tarda, нар. назвы: дроп, крохва) трапляліся на Беларусі. Апошняя знаходка Д. на тэр. БССР датуецца 1929.



Драфа звычайная (самец і самка).

Памеры птушак сярэднія і вялікія (еўрапейская Д. важыць 7,5—12 *кг*, самцы бываюць да 16 і нават да 21 *кг*). Апярэнне стракатае з пераважай бурага, шэрага, чорнага і белага колераў. Д. аселыя і вандроўныя птушкі. Жывуць у стэпах і паўпустынях. Вельмі асцярожныя. Нясуць 1—3, часам 9 яец. Корм пераважна расліннy. Каштоўныя паляўнічыя птушкі. У 60-я г. 20 ст. да атр. Д. пачалі адносіць сям. *аўдотак* (Burhinidae).

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

М. С. Долбік. Мінск.

ДРОЦІК, невялікае кап'ё для кідання з крамянёвым, касцяным або жалезным накапечнікам. Вядомы з эпохі верхняга палеаліту, ім карысталіся стараж. грэкі, рымляне, скіфы.

а таксама плямёны, якія жылі на тэр. Беларусі ў жал. век. На Русі Д. (суліца) быў на ўзбраенні да 15 ст.

ДРУГАСНАЯ ЭЛЕКТРОННАЯ ЭМІСІЯ, выхад электронаў з металаў, паўправаднікоў і дыэлектрыкаў пры бамбардзіроўцы іх паверхні патокам першасных часцінак.

Адносіны колькасці другасных электронаў да колькасці першасных часцінак наз. каэфіцыентам другаснай эмісіі. Каэфіцыент Д. э. э. залежыць ад уласцівасцей пучка першасных часцінак (энергіі, вугла падзення) і ад прыроды, спосабу апрацоўкі і стану паверхні рэчыва, што бамбардзіруецца. Выкарыстоўваецца Д. э. э. ў фотапамнажальніках (гл. *Памнажальнік*), дзе пры некалькіх каскадах памнажэння можна атрымаць павелічэнне току ў 10^7 разоў, у лямпах з халодным катодам, для атрымання газавага разраду і ў інш. прыладах.

Літ.: Бронштейн И. М. и Фрайман Б. С. Вторичная электронная эмиссия, М., 1969; Добрецов Л. Н. и Гомоюнова М. В. Эмиссионная электроника, М., 1966, с. 315—401.

ДРУГАСНЫЯ МІНЕРАЛЫ, мінер. новаўтварэнні, якія ўзнікаюць у горнай пародзе пасля яе фарміравання ў выніку больш позніх працэсаў хім. разлажэння, замяшчэння ці распаду раней утвораных мінералаў або шляхам адкладвання непасрэдна з растворaў у шчылінах і пустотах. Утварэнне Д. м. залежыць ад змены фізіка-хім. умоў асяроддзя (т-ры, ціску, фазавай раўнавагі і інш.). Найб. пашыраны Д. м. ў корах выветрывання зоны *гіпергенезу* (гідравокіслы жалеза, каалініт, карбанаты, гіпс і інш.). Формы мінералаў — псеўдамарфозы па іншых крышталях ці рэштках жывёл і раслін, зямлістыя агрэгаты, скарынкі і плёнкі замяшчэння, уключэнні (канкрэцыі). Гл. таксама *Гіпергенныя мінералы.*

ДРУГАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ АБЛАСНОГА САЮЗА РСДРП ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ, адбылася ў 2-й пал. лют. ці ў 1-й пал. сак. 1907. Прысутнічалі дэлегаты з рашаючым голасам ад Вілейскай, Мінскай, Дзвінскай, Бабруйскай, Барысаўскай, Віцебскай, Ковенскай, Смаленскай арг-цый РСДРП, з дарадчым — прадстаўнікі ЦК РСДРП, камітэта Абласнога саюза РСДРПЛіБ, ЦК Бунда, запрошаныя. Персанальны склад дэлегатаў, дакладная дата і месца правядзення канферэнцыі невядомыя.

Парадак дня: 1) Справаздачы арг-цый РСДРП Паўн.-Зах. краю пра выбарчую кампанію; 2) Аб заканчэнні выбарчай кампаніі.

У перыяд адступлення рэвалюцыі 1905—07 бальшавікі імкнуліся скарыстаць выбары ў 2-ю Дзярж. думу як трыбуну для рэвалюц. агітацыі, выкрыцця самадзяржаўя і контррэвалюц. буржуазіі. Але масавыя арышты, барацьба ўнутры арг-цый РСДРП паміж бальшавікамі і меншавікамі; нацыяналізм Бунда перашкодзілі бальшавікам Беларусі разгарнуць шырокую дзейнасць. Канферэнцыя адзначыла, што дзейнасць сацыял-дэмакратаў у час выбарчай кампаніі была недастаткова арганізаваная, выкрываць нацыяналіст. палітыку буржуазіі перашкаджала пазіцыя Бунда. Як станоўчае канферэнцыя канстатавала рост свядомасці працоўных, узмацненне сярод іх уплыву сацыял-дэмакратыі; у тых месцах, дзе вялася паліт. агітацыя, выбаршчыкамі і ўпаўнаважанымі выбіраліся сацыял-дэмакраты ці тыя, што далучаліся да іх. Па засіллю меншавікоў сведчыць меншавіцкі характар рэзалюцыі канферэнцыі. Замест бальшавіцкага патрабавання растлумачваць працоўным няздольнасць Думы абараняць іх інтарэсы, клікаць да ўзбр. паўстання і замены Думы Устаноўчым сходам канферэнцыя рэкамендавала ўсім с.-д. арг-цыям растлумачваць насельніцтву вынікі выбараў і праз выбаршчыкаў рабочых і сялянскіх упаўнаважаных рабіць націск на дзейнасць Думы. Канферэнцыя выбрала новы абл. камітэт.

Літ.: Кузнецов А. На пути к Октябрю, Мн., 1970, с. 88; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962, с. 406—407.

К. І. Шабуня. Мінск.

ДРУГАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ КАМПАРТЫІ ЛІТВЫ І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ, адбылася 2—4.2.1919 у Вільні. Прысутнічалі 64 дэлегаты ад парт. арг-цый Літвы і Зах. Беларусі, у т. л. ад Гродзенскай, Лідскай, Пліскай (Дзісенскага пав.); прадстаўнікі РКП(б), Маскоўскай бел. секцыі РКП(б), Камуніст. саюза моладзі.

Парадак дня: 1) Даклады з месцаў; 2) Тактыка партыі; 3) Адносіны да Часовага рэвалюц. ўрада Літвы; 4) Савецкае буд-ва; 5) Адносіны да Сав. Расіі; 6) Аграрнае пытанне; 7) Арганізацыйнае пытанне.

Канфер. прыняла рэзалюцыю «Пра аб'яднанне Літвы і Беларусі». Адзначыўшы, што Літва і Беларусь у гасп. і культ. адносінах маюць многа агульнага, а барацьба з контррэвалюцыяй з боку бурж. Польшчы патрабуе стварыць адзіны фронт, канфер. прызнала «унію Літвы з Беларуссю ў вышэйшай ступені пажаданай» і выказала спадзяванне, што яна будзе першым крокам да федэратыўнага аб'яднання ўсіх сав. рэспублік. За аснову сав. буд-ва канфер. рэкамендавала ўзяць Канстытуцыю РСФСР, дастасоўваючы яе да мясцовых умоў; сельскія Саветы называць Саветамі рабочых дэпутатаў, стварацъ Саветы с.-г. рабочых; абавязала парт. арг-цыі звярнуць асаблівую ўвагу на ўздым с. гасп., для абароны Сав. улады тэрмінова навучыць ваен. справе ўсіх чл. партыі. Па аграрным пытанні ўхваліла палітыку нацыяналізацыі зямлі, даручыла рэўкомам арганізоўваць с.-г. рабочых у вытворчыя саюзы, рашуча выступіла супраць раздзелу маёнткаў па карысць працоўных сялян, супраць таго, каб дацъ сялянам выбарчае права, што пярэчыла бальшавіцкай тактыцы саюзу з серадняком пры апоры на беднату. Канфер. падкрэсліла велізарнае значэнне барацьбы пралетарыяту Расіі супраць імперыял. захопнікаў і паставіла перад *Камуністычнай партыяй Літвы і Заходняй Беларусі* задачу весці работу па арганізацыі пралетарыяту, праясняць яго класавую свядомасць, змагацца супраць бурж. і дробнабурж. партый у краі, вітала ўтварэнне Камуніст. саюза моладзі.

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.), Мн., 1934.

Я. Н. Шкляр. Мінск.

ДРУГАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ КПЗБ, адбылася нелегальна 30.11.1924 у Вільні. Прысутнічала

17 дэлегатаў, з іх 14 з рашаючым голасам: 11 дэлегатаў ад Віленскай, Гродзенскай, Беластоцкай, Баранавіцка-Слонімскай, Пінскай і Брэсцкай акруг, 2 ад ЦК КПЗБ, 1 ад ЦК КСМЗБ; 10 прафесійных работнікаў партыі, 3 рабочыя, 4 селяніны.

Парадак дня: Справаздача ЦК КПЗБ; Даклад аб V Кангрэсе Камінтэрна; Пытанні тактыкі; Пра аб'яднанне Зах. Беларусі з БССР; Арганізацыйныя пытанні; Бягучыя пытанні; Выбары ЦК КПЗБ; Выбары дэлегатаў на III з'езд КПРП.

У справаздачы ЦК адзначалася, што за перыяд ад I канферэнцыі (кастр. 1923) КПЗБ выраслa колькасна (2296 чл. партыі, аб'яднаных у 433 гурткі, 45 райкомаў, 6 акруговых к-таў) і стала сур'ёзным паліт. фактарам Зах. Беларусі і ўсёй Польшчы. Канферэнцыя ўхваліла рашэнні V Кангрэсу Камінтэрна, асудзіла нападкі Троцкага на ленінізм і ЦК РКП(б). У рэзалюцыі «Аб формах рэвалюц. барацьбы ў Зах. Беларусі» вызначаліся характар і мэты нац.-вызв. барацьбы працоўных, тактыка партыі на бягучы перыяд. Пад уплывам моцнага партыз. руху ў Зах. Беларусі, «рэвалюцыйнага ўздыму сялянскіх мас, які ў недалёкім будучым можа вылiцца ва ўзброенае паўстанне супраць ненавіснай акупацыі», канферэнцыя вызначыла курс на «арганізацыйную і палітычную падрыхтоўку да ўзброенага паўстання» і заклікала байкатаваць падаткі. Такія ўстаноўкі зыходзілі з перабольшвання рэвалюц. гатоўнасці сялян да непасрэднай барацьбы, не ўлічвалі спаду рэвалюц. хвалі ў Польшчы, а таксама слабасці рэвалюц. руху ў гарадах Зах. Беларусі, таму былі адменены рашэннем III з'езду КПРП (студз. 1925) як няправільныя. Канферэнцыя адкінула лозунг аўтаноміі для Зах. Беларусі ў межах бурж. Польшчы, выстаўлены партыямі ППС, «Вызваленне», бел. бурж. нацыяналістамі, і процiпаставіла яму лозунг аб'яднання Зах. Беларусі з БССР. На канферэнцыі намеціліся розногалоссі па тактычных і арганізацыйных пытаннях, якія прывялі да ўзнікнення ў КПЗБ антыпартыйнай нацыяналістычнай групоўкі пад назвай *сэцэсія.* Канферэнцыя паслала прывітанне камуністычным дэпутатам сейма і палітычным вязням Польшчы.

У ЦК КПЗБ па канферэнцыі выбраны: П. *Корчык* (І. К. Лагіновіч), Л. Н. *Аранштам*, А. П. *Дацкі*), В. З. *Харужая*, С. Т. *Мілер* (І. Р. Валевіч), А. Р. *Капуцкі*, Л. І. *Родзевіч* (А. Сталевіч) і інш.: першыя 5 выбраны і дэлегатамі на III з'езд КПРП.

Літ.: II Конференция Компартии Западной Беларуси, Вильня, 1925; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929 гг.), Мн., 1962, с. 239—242; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939 гг.), Мн., 1966, с. 94—100; Глинская Т. Ю. КПЗБ — руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924—1928 гг., Мн., 1965; Валерій. Успаміны падпольшчыка, 1921—1925 гг., Мн., 1935.

Т. Ю. Глінская. Мінск.

ДРУГАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РСДРП («Першая Агульнарасійская»), адбылася 3—7(16—20).11.1906 у Тамерфорсе. Прысутнічалі 32 дэлегаты з рашаючым голасам (у т. л. 1 ад Абл. саюза РСДРП Літвы і Беларусі), з іх 6 бальшавікоў, 5 ад Сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы і 3 ад Сацыял-дэмакратыі Латышскага краю (падтрымлівалі бальшавікоў), 11 меншавікоў і 7 бундаўцаў; з дарадчым голасам чл. ЦК і рэдакцыі ЦО.

Парадак дня: 1) Выбарчая кампанія; 2) Парт. з'езд; 3) Рабочы з'езд; 4) Барацьба з чорнай сотняй і пагромамі; 5) Партызанскія выступленні.

Пра выбарчую кампанію ў 2-ю Дзярж. думу заслуханы 4 дакл.: бальшавіцкую тактыку супраць блоку з кадэтамі абаранялі У. І. Ленін і А. Варскі; меншавіцкую тактыку блоку з кадэтамі — Л. Мартаў і Р. Абрамовіч. 18 галасамі супраць 14 канфер. прыняла меншавіцкую рэзалюцыю, у якой дапускалася тактыка блоку з кадэтамі. Ленін ад імя 14 дэлегатаў Пецярбурга, Масквы, Цэнтр.-Прамысл. вобласці, Паволжа, Сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы і Сацыял-дэмакратыі Латышскага краю ўпёс «Асобную думку» — бальшавіцкую платформу, у якой патрабавалася арганіз. і ідэйная самастойнасць РСДРП у выбарчай і думскай кампаніі; прыватныя блокі і пагадненні дапускаліся толькі на вышэйшай ступені выбарчай кампаніі з партыямі, якія прызнавалі неабходнасць узбр. паўстання і змагаліся за дэмакр. рэспубліку. Канфер. прыняла рэзалюцыю «Аб адзінстве выбарчай кампаніі на месцах» з папраўкай Леніна, якая абмяжоўвала меншавіцкі ЦК у правядзенні на месцах тактыкі блоку з кадэтамі. Канфер. выказала думку пра пажаданасць чарговага парт. з'езду не пазней 15(28).3.1907. Ленін патрабаваў агітацыю за «рабочы з'езд» лічыць парушэннем парт. дысцыпліны. Канфер. не абмяркоўвала пытання пра «рабочы з'езд»; у кампраміснай рэзалюцыі яна асудзіла актыўныя дзеянні па арганізацыі «рабочага з'езду», але дапускала дыскусіі па гэтым пытанні. Прыняла рэзалюцыю пра ўдзел арг-цый у выдатках на скліканне парт. з'езду.

Літ.: Ленін У. І. Аб блоках з кадэтамі. Барацьба з кадэцтвуючымі с.-д. і партыйная дысцыпліна, Тв., т. 11 (Поли. собр. соч., т. 14); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954. *К. І. Шабуня.* Мінск.

ДРУГАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ СМАРГОНСКАЙ АКРУГОВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП, адбылася ў канцы жн. 1906 у Смаргоні. 8 дэлегатаў з рашаючым голасам і 3 з дарадчым ад Валожынскай, Даўгінаўскай, Лебедзеўскай, Смаргонскай арг-цый РСДРП і ад Палачанскай воласці Ашмянскага пав. з'яўляліся прадстаўнікамі 632 чл. партыі.

Парадак дня: 1) Справаздачы з месцаў; 2) Пра бягучы момант і бліжэйшыя задачы парт. дзейнасці; 3) Пра пастаноўку мясцовай работы (сярод рабочых і сялян); 4) Пра буд-ва акруговай арг-цыі і яе адносіны да Смаргонскай групы РСДРП; 5) Аграрная праграма.

Са справаздач з месцаў відаць, што арг-цыі РСДРП вялі значную агіт. і арганіз. работу. *Даўгінаўская арганізацыя РСДРП* (80 чл.) трымала сувязь з 13 вёскамі, летам 1906 правяла забастоўкі касцоў і жнеяў, выдала 4 лістоўкі. Валожынская арг-цыя (30 чл.) актыўна вяла агітацыю ў р-не в. Пяршаі — Вішнева; у р-не Мінцi — Белякі (7 вёсак) штоты-

дзень праводзіла сходы, на якіх прысутнічала па 30—50 сялян. Лебедзеўская арг-цыя (22 чл.) кіравала забастоўкай с.-г. рабочых, *Смаргонская арганізацыя РСДРП* (каля 500 чл.) вяла паліт. агітацыю сярод рабочых, з якіх 800 былі пад моцным уплывам РСДРП. Распаўсюджваліся выданні Мінскай арг-цыі, Віленскага к-та, *Абласнога саюза РСДРП Літвы і Беларусі*. Канфер. адзначыла, што ў аб-ставінах, якія склаліся пасля разгону I Дзярж. думы, найбліжэйшая задача парт. дзейнасці — падрыхтоўка ўзбр. паўстання, скліканне Устаноўчага сходу, аднак пад уплывам меншавікоў рэкамендавала пасіўныя сродкі барацьбы: не даваць рэкрутаў, не плаціць падаткаў, прапагандаваць думку пра стварэнне Саветаў сялянскіх дэпутатаў, у той час як У. І. Ленін і бальшавікі стаялі за ваен. арганізацыю мас. Канфер. абавязала с.-д. групы *Смаргонскай акруговай арганізацыі РСДРП* весці сярод сялянства паліт. прапаганду, стварацъ рэвалюц. сялянскія к-ты і распаўсюджваць на іх уплыў РСДРП, аб'ядноўваць гарадскі і сельскі пралетарыят у самастойную класавую партыю, пастанавіла ў найбліжэйшы час стварыць з рамеснага пралетарыяту, парабкоў і паўпарабкоў новыя парт. арг-цыі ў Вілейцы, Куранцы, Вішневе, рэвалюц. сялянскія к-ты ў Даўгінаве, Валожыне, Лебедзеве, Палачанах і Вішневе, вызначыла структуру сялянскіх к-таў і Смаргонскай акр. арг-цыі (гл. *Акруговыя арганізацыі РСДРП*), даручыла Смаргонскай арг-цыі РСДРП склікаць сялянскі з'езд. Слухаўся даклад аб агр. праграме, прынятай на IV (Аб'яднаўчым) з'ездзе РСДРП (1906).

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955, с. 582—586; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918), Мн., 1962, с. 159—160; Кузняев А. На пути к Октябрю, Мн., 1970, с. 84—85; Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962, с. 339—341. *К. І. Шабуня.* Мінск.


ДРУГАЯ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЯ АБЛАСНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РСДРП(б) (падзвычайная), адбылася 5—7(18—20).10.1917 у Мінску. 247 дэлегатаў з рашаючым голасам і 106 з дарадчым з'яўляліся прадстаўнікамі 28 591 чл. партыі і 27 856 спачувальных ад Гомеля, Бабруйска, Віцебска, Слуцка, Нясвіжа, Оршы, Рагачова, Мінска, Лунінца, Замір'я, Гарадка, Івянца, Зах. фронту. За 20 дзён, якія мінулі пасля *Першай Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РСДРП(б)*, парт. арг-цыя Беларусі і Зах. фронту павялічылася больш чым у 6 разоў.

Парадак дня: 1) Даклад абл. бюро (У. С. Селязнёў); 2) Перавыбары Саветаў, армейскіх к-таў і тактыка партыі (В. В. Фамін); 3) Устаноўчы сход; 4) Перагляд парт. праграмы (А. Ф. Мяснікоў); 5) Парт. з'езд (17 кастрычніка); 6) Сувязь, агітацыя і транспарт л-ры (М. М. Васільеў); 7) Кандыдацкі спіс ва Устаноўчы сход; 8) Бягучыя справы.

Работа канферэнцыі праходзіла пад знакам непасрэднай падрыхтоўкі сацыяліст. рэвалюцыі. Канферэнцыя паслала прывітанне У. І. Леніну. Яна адзначыла, што абл. к-т правёў значную арганіз. і агітац.-прапагандысцкую работу — прачытана больш за 40 дакладаў, масавымі тыражамі выдаваліся брашуры і лістоўкі, наладжана выданне бальшавіцкай газ. *«Молот»* замест закрытай Часовым урадам «Звезды». Канферэнцыя ўхваліла паліт. лінію і практ. дзейнасць абл. бюро. Яна падкрэсліла, што найважнейшай задачай выратавання краіны і рэвалюцыі з'яўляецца пераход улады ў цэнтры і на месцах да Саветаў, прапанавала парт. арг-цыям зрабіць усё, каб своечасова склікаць II Усерас. з'езд Саветаў, вырашыла неадкладна перавыбраць Саветы і перш-наперш армейскія к-ты, каб яны выказвалі волю і абаранялі інтарэсы працоўных мас. Канферэнцыя прызнала недапушчальным, каб пры выбарах ва Устаноўчы сход бальшавікі ўваходзілі ў блок са згодніцкімі партыямі і зацвердзіла спіс кандыдатаў ад РСДРП(б) па Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай выбарчых акр. і Зах. фронце ў складзе Ф. Э. Дзяржынскага, А. Я. Бадаева, А. Ф. Мяснікова, К. І. Ландара, Л. В. Грамашэўскага, У. С. Селязнёва, І. Я. Алібегава, М. С. Ціхменева, І. К. Ксенафонтава, М. У. Рагазінскага, В. Я. Чунчына і інш. — усяго 44 чал. Канферэнцыя прапанавала змяніць паліт. і эканам. часткі праграмы-мінімум, агр. частку выпрацаваць на падставе рэвалюцыі VII (Крас.) Усерас. канфер. РСДРП(б); патрабавала ад парт. арг-цый шырока распаўсюджваць сярод працоўных бальшавіцкія выданні; асудзіла варожую дзейнасць чл. Франтавога камітэта Кажэўнікава, які выступіў у друку з ілжывай заявай, быццам Зах. фронт супраць склікання II з'езду Саветаў і не будзе пасылаць на яго сваіх дэлегатаў. Канферэнцыя заклікала парт. арг-цыі ўзмацніць паліт. і арганізацыйную работу ў масах; згуртаваць іх вакол Саветаў, якія павінны стаць органамі ўзброенага паўстання супраць буржуазнага Часовага ўрада, за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі.

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.), Мн., 1934; Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 1, Мн., 1957, с. 775—832; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 выд., Мн., 1968, с. 357—358; Бугаев Е. Возникновение большевистских организаций и образование Компартии Белоруссии, М., 1959, с. 145—148; Саладков И. И. Большевики Белоруссии в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции (март 1917 — февраль 1918), Мн., 1957, с. 210—212. *І. І. Саладкой.* Мінск.

ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА 1939—45, вайна, якая была спароджана сістэмай імперыялізму ў выніку рэзкага абвастрэння яго супярэчнасцей і пачалася спачатку ўнутры гэтай сістэмы паміж кааліцыяй фаш. дзяржаў — Германіяй і Італіяй, з аднаго боку, і Вялікабрытаніяй і Францыяй, з другога; пазней набыла сусв. характар і ператварылася ў вызв., антыфаш. вайну народаў і дзяржаў супраць блоку фаш. агрэсараў, якія мелі на мэце ўсталяваць сусв. панаванне, ліквідаваць нац. незалежнасць іншых краін і фізічна вынішчыць цалыя народы. Першапачаткова змену характару Д. с. в. абумовіла гал. ч. узнікненне *Руху Супраціўлення* ў акупаваных



фаш. Германіяй краінах Еўропы. Канчаткова вызн. характар Д. с. в. вызначыла і паглыбіла ўступленне ў вайну Сав. Саюза, на які вераломна напала гітлераўская Германія. Развязванню Д. с. в. спрыяла палітыка Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША, якія падбухторвалі фаш. агрэсараў, спадзеючыся накіраваць іх удар супраць СССР. Найб. відавочнай праявай гэтай палітыкі было *Мюнхенскае пагадненне 1938*, на падставе якога Германія захапіла Чэхаславакію. Напярэдадні вайны, летам 1939, урады Вялікабрытаніі і Францыі яшчэ спадзяваліся дасягнуць змовы з фаш. Германіяй і сарвалі перагаворы з СССР пра ўзаемную дапамогу (гл. *Маскоўскія перагаворы 1939*). У гэтых умовах Сав. Саюз вымушаны быў прыняць прапанову ўрада Германіі і заключыў з ёю ў жн. 1939 Пакт аб ненападзе, тым самым не дапусціў стварэння адзінага антысав. блоку капіталіст. дзяржаў.

Першы перыяд Д. с. в. (1.9.1939—22.6.1941) пачаўся з нападу Германіі на Польшчу. Вялікабрытанія і Францыя, як саюзніцы Польшчы, 3 вер. абвясцілі вайну Германіі, але актыўных ваен. дзеянняў не вялі, хоць мелі перавагу ў ваен. сіле і тэхніцы на зах. фронце. За кароткі час польская армія была пераможана (гл. *Германа-польская вайна 1939*).

Пры падбухторванні імперыялістаў Вялікабрытаніі, Францыі, ЗША і Германіі рэакц. колы Фінляндыі справакавалі ў ліст. 1939 вайну з СССР (гл. *Савецка-фінляндская вайна 1939—40*). Вялікабрытанія і Францыя рыхтавалі супраць СССР ваен. інтэрвенцыю, спадзяваліся прыцягнуць да яе і фаш. Германію. Перамога СССР над Фінляндыяй (сак. 1940) сарвала планы міжнар. рэакцыі. Правакац. палітыка ўрадаў Францыі і Вялікабрытаніі, якія адмовіліся весці актыўныя дзеянні супраць Германіі, дазволіла апошняй завалодаць ваен. ініцыятывай і на Захадзе. 9.4.1940 герм. армія без абвяшчэння вайны захапіла Данію і ўварвалася ў Нарвегію (поўнасцю акупавала 10.6.1940). 10 мая герм. войскі пачалі ваен. дзеянні супраць Нідэрландаў, Бельгіі, Люксембурга і Францыі. Герм. армія зрабіла глыбокі прарыў, вымусіла капітуляваць Нідэрланды (14 мая), Бельгію (28 мая) і прыціснула да мора каля Дзюнкерка англ. і франц. войскі. Англ. камандаванне змагло арганізаваць эвакуацыю сваіх войск і часткі франц. арміі на тэр. Вялікабрытаніі. Балвал тэхніка дасталася немцам. 10 чэрв. Італія абвясціла вайну Францыі і Вялікабрытаніі. 14.6.1940 Парыж без бою быў здадзены немцам, а 22 чэрв. франц. ўрад падпісаў акт капітуляцыі перад Германіяй і 24 чэрв. перад Італіяй. Большую частку франц. тэр. акупавала ням. армія. Вялікабрытанія апынулася перад непасрэднай пагрозай, што ўварвуцца фаш. войскі. Да 12.5.1941 на яе гарады і прамысл. цэнтры герм. бамбардзіровачная авіяцыя рабіла масіраваныя налёты. Адпаведна плану ўварвання ў Вялікабрытанію (план «Марскі леў») гітлераўскае камандаванне адклала ўвосень 1940 на нявызначаны час у сувязі з прынятым рашэннем пачаць вайну супраць СССР. З чэрв. 1940 пачаліся ваен. дзеянні невялікімі сіламі ва Усх. і Паўн. Афрыцы паміж англ. і італьян., потым паміж англ. і італа-ням. войскамі (гл. *Паўночнаафрыканскія аперацыі 1940—43*). 28.10.1940 фаш. Італія напала на Грэцыю, аднак сустрэла рашучы адпор. 6.4.1941 герм. армія пры падтрымцы італьян. і венг. войск уварвалася ў Югаславію і Грэцыю і захапіла іх. У акупаваных краінах Еўропы гітлераўцы ўсталёўвалі т. зв. «новы парадак» — ажыццяўлялі палітыку каланізацыі, рабаўніцтва і вынішчання насельніцтва. У Чэхаславакіі, Польшчы, Югаславіі, Францыі і інш. краінах узнік антыфаш. Рух Супраціўлення.


Другі перыяд Д. с. в. (22.6.1941— ліст. 1942) пачаўся вераломным нападам фаш. Германіі на СССР (гл. *Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—45*). У саюзе з Германіяй выступілі Італія, Румынія, Венгрыя, Фінляндыя, Славакія і фактычна Балгарыя.

Барацьба сав. народа супраць агрэсараў адпавядала жыццёвым інтарэсам усіх народаў, якія былі заняволены ці знаходзіліся пад пагрозай фаш. заняволення. З гэтым мусілі лічыцца ўрады Вялікабрытаніі і ЗША. Да таго ж іх імперыял. інтарэсам магла быць прычынена вял. шкода ў выпадку перамогі Германіі. На гэтай глебе ў ходзе вайны склалася антыгітлераўская кааліцыя дзяржаў і народаў, ва ўтварэнні якой вырашальную ролю адыграў Сав. Саюз. Кааліцыю афармілі сав.-англ. пагадненне пра сумесныя дзеянні ў вайне супраць Германіі (12.7.1941), дагаворы з Чэхаславакіяй (18.7.1941), з Польшчай (30.7.1941), рашэнні Маскоўскай канферэнцыі прадстаўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (29.9—1.10.1941; гл. *Маскоўскія нарады 1941, 1943, 1945*), *Атлантычная хартыя, Дэкларацыя 26 дзяржаў 1942*, англа-сав. саюзны дагавор (26.5.1942), сав.-амер. пагадненне (11.6. 1942). Хоць унутр. адзінства кааліцыі паслаблялася супярэчнасцямі паміж Вялікабрытаніяй і ЗША, з аднаго боку, і СССР, з другога, па пытаннях вядзення вайны і пасляваен. ўладкавання свету, яна адыграла вялізарную ролю ў перамозе над агрэсарамі. Часовая перавага ў сілах дазволіла ням. войскам прайсці ў глыбіню сав. тэр., выйсці да Ленінграда, стварыць пагрозу Маскве. Аднак у снеж. 1941 Чырв. Армія нанесла ворагу магутны ўдар пад Масквой (гл. *Маскоўская бітва 1941—42*) і тым самым пахавала міф пра непераможнасць герм. арміі. 7.12.1941 Японія напала на англ. і амер. ўладанні ў Ціхім ак. і распачала вайну супраць ЗША і Вялікабрытаніі (гл. *Ціхаакіянскія кампаніі*). 11.12.1941 Германія і Італія абвясцілі вайну ЗША. Але гал. падзеі адбываліся на сав.-герм. фронце, дзе летам 1942 было сканцэнтравана каля 240 дывізій немцаў і іх саюзнікаў (больш за 76% іх узброеных сіл на еўрап. і афр. тэатрах вайны).

Трэці перыяд Д. с. в. (ліст. 1942 — снеж. 1943) характарызуецца карэнным пераломам на карысць антыгітлераўскай кааліцыі. Пачаўся контрнаступленнем Чырв. Арміі на Волзе, якое скончылася поўным разгромам ням.-фаш. войск пад Сталінградам (гл. *Сталінградская бітва 1942—43*). Пасля перамогі сав. войск у *Курскай бітве 1943* стратэгічнай ініцыятывай на ўсім фронце канчаткова авалодала Чырв. Армія.

Набярэжная ў Дзюнкерку пасля ўцёкаў англа-французскіх войск (1940).







Крымская канферэнцыя кіраўнікоў СССР, Вялікабрытаніі, ЗША. У зале пасяджэнняў (1945).


Поспехі сав. войск спрыялі ўзмацненню Руху Супраціўлення і палегчылі ваен. аперацыі саюзнікаў на ўсіх франтах Д. с. в. 23.10.1942 англ. войскі пачалі наступленне ў раёне Эль-Аламейна (Егіпет), у ліст. амер.-англ. войскі высадзіліся ў Алжыры і Марока, у маі 1943 італа-ням. войскі ў Паўн. Афрыцы капітулявалі. На ціхаакіянскім тэатры вайны амер.-англ. войскі вялі другарадныя аперацыі. Вялікабрытанія і ЗША разлічвалі на аслабленне Сав. Саюза ў адзінаборстве з фаш. Германіяй і ўсяляк адцягвалі адкрыццё другога фронту на З Еўропы, хоць абяцалі адкрыць яго яшчэ ў 1942. Замест гэтага англ. і амер. войскі высадзіліся ў Сіцыліі (10.7.1943) і ў Паўд. Італіі (3.9.1943). Але гэта мела другарадное ваен. значэнне. 3.9.1943 Італія капітулявала, але большую частку яе тэр. паспелі акупаваць (да прыходу англа-амер. войск) немцы. 28.11—1.12.1943 адбылася *Тэгеранская канферэнцыя 1943* кіраўнікоў урадаў СССР, Вялікабрытаніі і ЗША, дзе была вызначана ўзгодненая стратэгія трох вялікіх краін у Д. с. в. На канферэнцыі урады ЗША і Вялікабрытаніі абавязаліся адкрыць другі фронт не пазней 1.5.1944.

Чацвёрты перыяд Д. с. в. (студз. 1944—май 1945) быў перыядам вырашальных перамог Чырв. Арміі, поўнага вызвалення сав. тэр. і ўсіх еўрап. краін ад фаш. акупацыі, канчатковага разгрому гітлераўскай Германіі і яе саюзнікаў у Еўропе. Летам 1944 Чырв. Армія нанесла сакрушальны ўдар ворагу на Беларусі (гл. *Беларуская аперацыя 1944*), у выніку якога вызвалена ўся тэр. БССР, большая ч. Літ. ССР, усх. ч. Польшчы. На працягу 1944 ням.-фаш. войскі былі поўнасцю выгнаны з тэр. СССР.

Пад ударамі сав. войск гітлераўскі блок канчаткова разваліўся. У Румыніі 23.8.1944 і ў Балгарыі 9.9.1944 перамаглі нар. ўзброеныя паўстанні. 4.9.1944 выйшла з вайны Фінляндыя, у снеж. 1944 — Венгрыя. Румынія, Балгарыя і Венгрыя далучыліся да антыгітлераўскай кааліцыі і прынялі ўдзел у вайне супраць Германіі. Чырв. Армія ва ўзаемадзеянні з Нар.-вызв. арміяй Югаславіі і з удзелам балг. арміі разбіла ням. войскі на тэр. Югаславіі (гл. *Белградская аперацыя 1944*). Поспехі сав. войск дазволілі патрыётам Албаніі і Грэцыі вызваліць свае краіны ад ням. акупантаў. Ход вайны ў 1944 паказаў, што СССР здольны ўласнымі сіламі разграміць Германію і выратаваць народы Еўропы ад фаш. заняволення. Гэта вымусіла саюзнікаў, нарэшце, высадзіць 6.6.1944 свае войскі ў Паўн. Францыі і адкрыць другі фронт. 15.8.1944 саюзнікі высадзіліся і на Пд Францыі. Аднак наступленне яны развівалі марудна. Большая частка тэр. Францыі, у т. л. Парыж (25.8.1944), была вызвалена ўнутр. сіламі Супраціўлення. На Ціхім акіяне амер.-англ. войскі актывізавалі баявыя дзеянні. У лют. 1944 яны вызвалілі Маршалавы, у чэрв.—жн. Марыянскія а-вы, у канцы 1944 пачалі наступленне супраць асн. «лініі» яп. абароны, якая праходзіла праз Інданезію, Філіпінскія, Японскія і Курыльскія а-вы. Спадзеючыся схіліць Вялікабрытанію і ЗША да сепаратнага міру, герм. камандаванне арганізавала ў снеж. 1944 контрнаступленне ў Ардэнах (Бельгія). Аднак пачатае Чырв. Арміяй 12.1.1945 наступленне на шырокім фронце сарвала планы фаш. Германіі (гл. *Ардэнская аперацыя*). 4—11 лютага адбылася *Крымская канферэнцыя 1945* кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. На ёй былі ўзгоднены планы завяршэння вайны і прынцыпы пасляваен. ўладкавання свету, перш-наперш пасляваен. статуса Германіі. У сак. 1945 амер.-англ. армія перайшла Рэйн і рухалася ў глыбіню тэр. Германіі, амаль не сустракаючы супраціўлення. Асноўным франтам Д. с. в. аставаўся сав.-германскі. У пач. 1945 сав. войскі закончылі вызваленне Польшчы, Венгрыі, вызвалілі Усх. Аўстрыю, 16 крас. Чырв. Армія пачала *Берлінскую аперацыю 1945*, 25 крас. сав. войскі сустрэліся з амерыканскімі на Эльбе. 30 крас. Гітлер скончыў самагубствам. 2 мая сав. войскі поўнасцю авалодалі Берлінам. У ноч на 9 мая ў Берліне быў падпісаны акт пра безумоўную капітуляцыю Германіі. На заключным этапе вайны супраць фаш. Германіі адбыліся ўсенар. узброеныя паўстанні ў Паўн. Італіі (красавік), якое скончылася вызваленнем Італіі, і нар. паўстанне 1945 у Чэхаславакіі (з 1 мая), якое з дапамогай сав. войск (гл. *Пражская аперацыя 1945*) скончылася поўным разгромам ням.-фаш. акупантаў.


Вырашальны ўклад у перамогу над фаш. Германіяй зрабіў Сав. Саюз. Чырв. Армія разбіла 507 ням. і 100 дывізій інш. краін фаш. блоку, саюзнікі ж на ўсіх франтах разбілі толькі 176 варожых дывізій. Вялікі ўклад у справу разгрому фаш. Германіі зрабіў бел. народ. Звыш 1 млн. беларусаў змагалася ў радах Сав. Арміі. Беларусь была рэспубліка-партызанкай. У тыле ворага на часова акупаванай тэр. БССР у партыз. фарміраваннях, у арг-цыях камуніст. падполля змагалася больш за 440 тыс. чалавек (гл. *Партызанскі рух у Вялікай Айчыннай вайне 1941—45*). Скрыты партыз. рэзерв складаў каля 400 тыс. чал., якія знаходзіліся на пастаянным баявым уліку ў атрадах і брыгадах. Бел. нар. мсціўцы забілі і ранілі каля 500 тыс. гітлераўскіх салдат і афіцэраў і іх памагатых, пусцілі пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронецягнікі, знішчылі


Салдаты Войска Польскага праходзяць па вызваленай Варшаве (1945).

















Другая сусветная вайна 1939—45 гг. 1. Гітлераўскія салдаты ўзломліваюць польскую дзяржаўную граніцу (1 верасня 1939). 2. «Дзіўная вайна» ў Еўропе. Забавы французскіх салдатаў на лініі Мажыно (1939). 3. Танкавая калона фаш. Германіі на тэр. Бельгіі (1940). 4. Напад японскай авіяцыі на ваенна-марскую базу ЗША ў Пёрл-Харбары (7 снежня 1941). 5. Разбурэнні ў Ковентры (Вялікабрытанія) ад бамбардзіровак нямецкай авіяцыі. 6. Тэхніка, пакінутая нямецка-фашысцкімі захопнікамі пры адступленні ад Масквы. 7. Партызаны 1-га савецкага партыз. палка ў Францыі. 8. Нямецка-фашысцкія салдаты і афіцэры, узятыя ў палон у Сталінградзе (люты 1943).









Другая сусветная вайна 1939—45 ІІ.

1. Партызанскі атрад імя Панамарэнкі Мінскай вобласці ідзе на баявое заданне (1943).
2. Высадка англа-амерыканскіх войск у Нармандыі (Францыя, чэрвень 1944).
3. Жыхары Сафіі вітаюць Чырвоную Армію (верасень 1944).
4. Падпісанне акта аб безумоўнай капітуляцыі Германіі (у ноч на 9 мая 1945).
5. Хіросіма пасля выбуху атамнай бомбы (жнівень 1945).
6. Галоўныя ваенныя злачынцы перад судом народаў (Нюрнберг, 1946).







305 самалётаў, 1355 танкаў і бронемашын, звыш 18 700 аўтамашын, 939 складаў і г. д. Нямала беларусаў змагалася ў радах еўрапейскага Супраціўлення.

Пяты перыяд Д. с. в. (май — 2 вер. 1945) завяршыў ваен. дзеянні на Д. Усходзе і ў бас. Ціхага ак., прывёў да капітуляцыі Японіі і поўнага заканчэння Д. с. в.

17 ліп.— 2 жн. адбылася *Патсдамская канферэнцыя 1945* кіраўнікоў урадаў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі, якая выпрацавала праграму дэмілітарызацыі, дэнацыфікацыі і дэмакратызацыі Германіі. 8 жн. ў адпаведнасці з прынятым на Крымскай канферэнцыі 1945 абавязацельствам СССР абвясціў вайну Японіі. 10 жн. абвясціла вайну Японіі Мангольская Народная Рэспубліка, войскі якой прынялі ўдзел у ваен. дзеяннях разам з Чырв. Арміяй. За кароткі час Чырв. Армія разграміла яп. армію ў Паўн.-Усх. Кітаі, Карэі, на Паўд. Сахаліне, Курыльскіх а-вах і паставіла Японію магчымасці весці далей вайну (гл. *Савецка-японская вайна 1945*). 2.9.1945 яп. ўрад падпісаў акт пра безумоўную капітуляцыю. На заключным этапе вайны з Японіяй без усялякай ваен. патрэбы амер. авіяцыя скінула атамныя бомбы на яп. гарады Хіросіму (6 жн.) і Нагасакі (9 жн.). Гэтым самым ЗША спадзяваліся запалохаць народы свету новай зброяй і ажыццявіць свае намеры на ўсталяванне сусв. панавання. Д. с. в. доўжылася 6 гадоў, у ёй удзельнічала 61 дзяржава з нас. 1700 млн. чал., ваен. дзеянні ішлі на тэр. Еўропы, Азіі, Афрыкі і Акіяніі, у арміі было мабілізавана 110 млн. чал., страты забітымі — каля 50 млн. чал. Вайна паглынула (непасрэдна ваен. расходы разам са стратамі ад матэрыяльных разбурэнняў) каля 4 трыльёнаў долараў. Вялікія людскія і матэрыяльныя страты ў Д. с. в. прычынены бел. народу. За гады часовай акупацыі гітлераўцы загубілі на Беларусі больш за 2 млн. 200 тыс. сав. грамадзян і ваеннапалонных, вывезлі ў Германію на катаржныя работы каля 380 тыс. чал. Акупанты спалілі і разбурылі 209 гарадоў і гар. пасёлкаў, 9200 вёсак — 1,2 млн. будынкаў, нанеслі велізарныя страты прамысловасці і с. гасп. рэспублікі (гл. *Акупацыйны рэжым*).

Разгром фаш. Германіі і яе саюзнікаў у Еўропе і Азіі прывёў да рэзкага аслаблення капіталіст. сістэмы, садзейнічаў карэнному пераломуў суадносінах сіл на сусв. арэне на карысць сацыялізма і дэмакратыі, стварыў спрыяльныя гістар. ўмовы для ўздыму міжнар. рэвалюц., дэмакр. і нац.-вызв. руху. Вынікі Д. с. в. садзейнічалі паспяховаму ажыццяўленню рэвалюцый у многіх еўрап. і азіяцкіх краінах і стварэнню сусв. сістэмы сацыялізма, сталі пачаткам развалу калан. сістэмы імперыялізму. Іл. гл. таксама на ўклейцы «Другая сусв. вайна 1939—45».

Літ.: Брэжнеў Л. І. Вялікая перамога савецкага народа, Мн., 1965; Вторая мировая война, кн. 1—3, М., 1966 (Материалы научной конференции, посвященной 20-й годовщине победы над фашистской Германией); История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—1945, т. 1—6, М., 1960—65; Великая Отечественная война Советского Союза, 1941—1945. Краткая история, 2 изд., М., 1970; Израэлян В. Л. Антигитлеровская коалиция (Дипломатическое сотрудничество СССР, США и Англии в годы второй мировой войны), М., 1964; Проэктор Д. М. Война в Европе 1939—1941 гг., М., 1963; Ягодич. Агрессия и катастрофа. Высшее военное руководство фашистской Германии во второй мировой войне 1939—1945, М., 1968; Кузнец Ю. Л. От Пёрл-Харбора до Потсдама, М., 1970; Кулиш В. М. Второй фронт, М., 1960; Ягодич. Раскрытая тайна. Предыстория второго фронта в Европе, М., 1965; Израэлян В. Л. и Кутаков Л. Н. Дипломатия агрессоров, М., 1967; Реутов Г. Н. Правда и вымысел о второй мировой войне, 2 изд., М., 1970; Секистов В. А. Война и политика, М., 1970; Овсяный И. Д. Тайна, в которой война рождалась, М., 1971; История войны на Тихом океане, пер. с яп., т. 1—5, М., 1957—58; гл. таксама літ. пры арт. *Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза 1941—45*.

Д. В. Мельцэр, Л. М. Шнеерсон. Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД АРМІЙ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ, адбыўся 20—25.11(3—8.12).1917 у Мінску. Прысутнічала 714 чал., з іх 473 бальшавікі. З'езд абмеркаваў пытанні: бягучы момант; даклады пра дзейнасць Выканкома Франтавога к-та і ВРК Зах. фронту; арганізацыя арміі; заключэнне міру і дэмабілізацыя арміі; арганізацыя дапамогі ахвярам вайны і рэвалюцыі; выбары галоўнакамандуючага фронту; выбары Франтавога к-та; бягучыя справы. З дакладамі і садакладамі выступілі Р. К. Арджанікідзе [ад ЦК РСДРП(б)], В. Валадарскі (ад Петраградскага ВРК), А. Ф. Мяснікоў, К. І. Ландар, М. У. Рагазінскі і інш. Салдацкія дэлегаты віталі перамогу сацыяліст. рэвалюцыі, заяўлялі пра гатоўнасць абараняць Сав. ўладу, выкрывалі згодніцкую палітыку меншавікоў і эсэраў. Галоўнакамандуючым Зах. фронту выбраны А. Ф. Мяснікоў. У Франтавы к-т увайшло 100 чал., з іх 80 бальшавікоў. У ВЦВК з'езд выбраў 20 чал., з іх 18 бальшавікоў. 26 ліст. (9 снеж.) выбраны з'ездам выканком увайшоў у склад Выканкома Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобл. і фронту.

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 2, Мн., 1957, с. 266—289; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967, с. 406—409; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968.

А. В. Вараб'ёў. Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД КП(б)Б (Аб'яднаўчы), адбыўся 4—6.3.1919 у Вільні. 169 дэлегатаў ад 17 636 камуністаў Мінскай, Гродзенскай, Віцебскай і ч. Ковенскай губ.

Парадак дня: 1) Даклады ЦБ КП(б)Б і ЦК КП(б)Л (В. Г. Кнорын, А. І. Вайнштэйн-Браноўскі); 2) Аб'яднанне Кампартыі Беларусі і Кампартыі Літвы (В. С. Міцкявічус-Капсукас); 3) Камуніст. Інтэрнацыянал (В. С. Міцкявічус-Капсукас); 4) Арганіз. пытанне; 5) Саветы і партыя (І. І. Рэйнгольд); 6) Работа на вёсцы; 7) Ваеннае пытанне (А. Ф. Мяснікоў); 8) Праграма Камуніст. партыі (А. Ф. Мяснікоў); 9) Выбары.

З'езд ухваліў дзейнасць ЦБ КП(б)Б і ЦК КП(б)Л, горача вітаў утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі і пастанавіў аб'яднаць Кампартыю Беларусі і Кампартыю Літвы ў адзіную *Камуністычную партыю (бальшавікоў) Літвы і Беларусі* [КП(б)ЛіБ] як састаўную частку РКП(б). З'езд вызначыў узаемаадносіны Камуніст. партыі і Саветаў і, каб павысіць уплыў камуністаў, прапанаваў ва ўсіх сав. арг-цыях ствараць парт. фракцыі. Ён выказаў думку пра неабходнасць стварэння класавай, строга дысцыплінаванай Чырв. Арміі, захавання ў арміі ін-та паліт. камісараў, іх кантролю над ваен. спецыялістамі, узмацнення паліт. работы сярод байцоў і камандзіраў, стварэння ў кожнай часці парт. ячэйкі. З'езд даручыў дэлегацыі, выбранай на VIII з'езд РКП(б), унесці свае прапановы адносна Праграмы партыі. Прыняў Пастанову пра парт. арг-цыі КП(б)ЛіБ, у якім патрабаваў усямерна ўмацоўваць адзінства партыі, ачышчаць яе ад чужых элементаў, павышаць ідэйны

ўзровень камуністаў, парт. дысцыпліну. Выначыў структуру парт. органаў (ЦК КП(б)ЛІВ, губернскі ці раённы к-т, падраённы ці навітовы к-т, парт. ячэйкі, сначувальныя); удакладніў структуру сельскіх парт. арг-цый; надкрэсліў неабходнасць шырокага саўгаснага буд-ва, развіцця каапэрацыі. У рэзалюцыі пра Камуніст. саюз моладзі з'езд абавязаў мясцовыя к-ты КП(б)ЛІВ садзейнічаць умацаванню камсамола, вылучаць са свайго складу ініцыятыўныя групы для стварэння камсамольскіх ячэек, мець сваіх прадстаўнікоў у к-тах камсамола. Цэнтр. органам КП(б)ЛІВ з'езд выразнуў лічыць газ. «Звезду» на рус., «Miot» («Молат») на польскай, «Komunistas» («Камуніст») на літ., «Дэр Штэрн» («Зорка») на яўр. мовах.

З'езд выбраў ЦК КП(б)ЛІВ, 18 дэлегатаў на VIII з'езд РКП(б); 8.3.1919 на пасяджэнні ЦК выбраны Прэзідыум ЦК КП(б)ЛІВ: В. С. Міцкявічус-Капсукас, З. І. Ангарэц, А. Ф. Мясніков, В. Г. Кнорын, Н. Г. Далецкі, С. В. Іваноў. Старшынёй Прэзідыума выбраны В. С. Міцкявічус-Капсукас, сакратаром ЦК — В. Г. Кнорын.

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.). Мн., 1934; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, с. 441—443; Шиляр Е. И. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1918—1920 гг.), Мн., 1962. *Н. І. Шкляр.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД КПЗБ, адбыўся 9—18.5.1935 у в. Сляпянка каля Мінска. 21 дэлегат з рашаючым голасам і 13 з дарадчым больш як ад 3300 чл. КПЗБ (без уліку зняволеных у турмах і канцэнтрацыйных лагерах) ад Віленскай, Беластоцкай, Гродзенскай, Слонімскай, Навагрудскай і Глыбоцкай акруг КПЗБ. Прысутнічалі прадстаўнікі Выканкома Камінтэрна (В. Г. Кнорын і В. Калараў), ЦК КПП (Ю. Ленскі, В. Вранкоўскі, Ф. І. Гжэльчак), ЦК КПЗУ, Выканкома КПМа і ЦК МОПРа, КСМЗБ, дэлегацыя ад КП(б)Б (М. Ф. Гікала, Д. І. Валковіч, М. М. Галадзед і інш.).

Парадак дня: 1) Паліт. сітуацыя ў Польшчы, задачы рабочы і антыфаш. народны фронт (Ю. Ленскі); 2) Паліт. справаздача ЦК КПЗБ і задачы партыі (П. Корчын (І. К. Лагіновіч)); 3) Задача партыі ў нац.-вызв. руху (М. С. Арэхва); 4) Справаздачы мандатная, арганізацыйная, прафсаюзная, рэвізійнай і маладзёжнай камісій. З'езд абмеркаваў тансама дзейнасць камсамола Зах. Беларусі.

З'езд абмеркаваў дзейнасць партыі за перыяд ад І з'езду КПЗБ (1928), ухваліў паліт. лінію і практ. дзейнасць ЦК, вызначыў задачы партыі на развіцці рэвалюц. і нац.-вызв. руху ва ўмовах наступлення фашызму і нарастання ваен. небяспекі. Гал. недахопам у дзейнасці партыі за справаздачны перыяд з'езд лічыў сектанцкія погляды і метады работы, што выліваліся в напыранай тады ў камуніст. руху намыляванай «тэорыі сацыял-фашызму», якая разглядала с.-д. і сялянскія партыі як састаўныя часткі фаш. лагера. Гэта адмоўна адбівалася на рабоце для дасягнення адзінства дзеянняў камуністаў з працоўнымі, якія знаходзіліся ў радах і пад уплывам дробнабурж. згодніцкіх і нацыяналіст. партый, рэфармісцкіх і рэакц. прафсаюзаў. З'езд адзначыў, што, ліквідуючы гэтыя недахопы, КПЗБ зрабіла першыя сур'ёзныя крокі ў практ. ажыццяўленні тактыкі адзінага фронту. Каб узняць на рэвалюц. барацьбу супраць фашызму і акупац. рэжыму больш шырокія нар. масы Зах. Беларусі, з'езд паставіў перад партыяй задачу: расшырыць адзіны рабочы фронт, аб'яднаць вакол пралетарыяту ўсе антыфаш. сілы, стварыць на гэтай аснове антыфаш. народны фронт для барацьбы супраць фашызму, акупацыі Зах. Беларусі, у абарону агульнадэмакр. патрабаванняў мас. Асновай антыфаш. нар. фронту павінны быць патрабаванні адмены фаш. канстытуцыі і выбарчага закону, увядзенне ўсеагульнага, роўнага, тайнага, прамога і прапарцыянальнага выбарчага права ў сейм, сенат і мясцовае самакіраванне, барацьба супраць надрыхтоўкі польскім фашызмам вайны з СССР, супраць прагітлераўскай знешняй палітыкі, за ўстанаўленне добрасуседскіх адносін з СССР. Ідучы на ўступкі ў асобных эканам. і паліт. пытаннях, кампартыя ў той жа час павінна цвёрда стаць на пазіцыях класавай барацьбы, адкрыта гаварыць масам аб праграмных і тактычных розногалоссях са згодніцкімі партыямі. З'езд ускрыў прычыны аслаблення ў сярэдзіне 30-х г. нац.-вызв. руху, заклікаў парт. арг-цыі ўмацаваць барацьбу супраць нац. прыгнёту і паланізацыі, за школу на роднай мове, за свабоду слова, друку, арг-цый. З'езд паклаў парт. арг-цыі на далейшае ўмацаванне пралет. ядра ў партыі і ўмацненне яе ўплыву сярод рабочых асноўных прамысл. цэнтраў, чыгуначнікаў і с.-г. рабочых; на вылучэнне і выхаванне рабочага парт. актыву. Ва ўмовах нарастання нагрозы вайны супраць СССР з'езд абавязаў КСМЗБ узмацніць антываен. работу ў масах моладзі, камуніст. агітацыю сярод дапрызыўнікаў і салдатаў. З'езд паслаў прывітанне Выканкому Камінтэрна, ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б, ЦК КПЗУ, Чырв. Арміі, паліт. зняволеным у польскіх турмах.

З'езд выбраў ЦК КПЗБ: чл. П. Корчын (І. К. Лагіновіч), С. А. Мертонс, М. А. Пілічнай, М. С. Арэхва, Б. І. Шоламаў, М. Н. Маслоўскі, Ю. Врублеўскі, Л. М. Янкоўская, І. Ф. Сіменнікаў, Х. Р. Гелер, А. Раф; канд. С. М. Малько, М. М. Дворнікаў, Ф. В. Пірыпіна, В. К. Аболіна, М. С. Майскі. Першым б чл. ЦК выбраны дэлегатамі на VII Кангрэс Камінтэрна. На арганіз. пленуме ЦК КПЗБ 19.5.1935 першым з чл. ЦК выбраны чл. Бюро ЦК.

Літ.: Решения II съезда Коммунистической партии Западной Белоруссии, Вильна, 1935; Революционный путь компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966, с. 318—323. *М. С. Арэхва.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД РСДРП, адбыўся 17(30).7—10(23).8.1903 нелегальна на мяжой — у Бруселі (13 пасяджэнняў) і ў Лондане (24 пасяджэнні). 43 дэлегаты з 51 рашаючым голасам (некаторыя к-ты замест 2 прыслалі на адным дэлегаце з 2 галасамі) і 14 дэлегатаў з дарадчым прадстаўлялі 26 с.-д. арг-цый. З'езд на сваім складзе быў неаднародны. Паслядоўныя пралетарскія рэвалюцыянеры, «іскраўцы большасці» («цвёрдыя» — ленінцы), мелі 24 галасы — 20 дэлегатаў: У. І. Ленін, М. Э. Ваўман, Л. С. Віленскі, У. Н. Гарын-Галкін, С. І. Гусеў, А. Г. Зурабаў, Р. С. Зямлячка, Л. М. Кіпіновіч, В. М. Кнунянц, П. А. Красікаў, М. М. Лядаў, Л. Д. Махліс, Г. М. Мінаеў, І. К. Шкіцін, Г. В. Пляханаў (пасля з'езду перайшоў да меншавікоў), А. М. Станаў, С. І. Сцяпанаў, Д. А. Танурыдзе (у канцы з'езду галасаваў з «іскраўцамі меншасці»), Да. І. Ульянаў, А. В. Шотман. Анартыністы і згоднікі падзяліліся на групы: а) «іскраўцы меншасці» («мяккія» — мартаўцы) — 7 дэлегатаў, 9 галасоў; б) цэнтрысты («балота») — 8 дэлегатаў, 10 галасоў; в) антыіскраўцы (адкрытыя анартыністы) — 8 дэлегатаў (3 «эканамісты», 5 бундаўцаў).

Парадак дня: 1) Канстытуіраванне з'езду. Выбары бюро. Вызначэнне рэгламенту з'езду і парадку дня. Даклад арганіз. к-та (В. І. Раманаў (Напоў)). Справаздача камісіі па праверцы мандатаў і па вызначэнні складу з'езду (В. А. Гінзбург (Кальцоў)); 2) Месца Бунда ў РСДРП (М. І. Лібер (Гольдман), Л. Мартаў (Ю. О. Цедэрбаўм)); 3) Праграма партыі; 4) Цэнтр. орган партыі; 5) Дэлегацкія даклады; 6) Арганізацыя партыі (абмеркаванне арганіз. пытанняў, Статута партыі) (У. І. Ленін); 7) Расійскі і нац. арг-цыі (У. А. Носкоў (Глебаў)); 8) Асобныя групы партыі (У. І. Ленін); 9) Нац. пытанне; 10) Іскранам, барацьба і прафесійны рух; 11) Салтыкаванне і Маі; 12) Міжнар. сацыяліст. кангрэс у Амстэрдаме 1904; 13) Дэманстрацыі і паўстанні; 14) Тэрор; 15) Унутр. пытанні парт. работы (настаноўка прапаганды, агітацыі, парт. л-ры, работы у сялянстве, у войску, сярод навучэнцаў, сектантаў); 16) Адносіны РСДРП да эсэраў; 17) Адносіны РСДРП да рус. ліберальных плыняў; 18) Выбары ЦК і рэдакцыі ЦО партыі; 19) Выбары Савета партыі; 20) Парадак абвінавачэння рашэнняў і пратаколаў з'езду, а таксама і парадак уступлення ў выкананне сваіх абавязкаў выбраных службовых асоб і устаноў.

Паводле вызначэння У. І. Леніна, гал. задача з'езду заключалася «ў стварэнні сапраўднай партыі на тых прынцыповых і арганізацыйных асновах, якія былі выстаўлены і распрацаваны «Искрой» (Тв., т. 7, с. 193). Неаднародны склад з'езду вызначыў жорсткую барацьбу пры абмеркаванні асн. пытанняў. Адным з гал. пытанняў з'езду было прынцыпе праграмы партыі. Абмеркаванне праекта праграмы, прапанаванага рэдакцыяй «Искры», праходзіла ў вострай барацьбе (9 пасяджэнняў). Рэвалюц. накіраванасць праграмы, асабліва ж пункт пра дыктатуру пралетарыяту, выклікалі нападкі анартыністаў. У выніку вострых спрэчак анартыністы нацярпелі паражэнне, і ў прынятай з'ездам праграме надкрэслівалася, што неабходнай умовай сацыяльнай рэвалюцыі з'яўляецца дыктатура пралетарыяту. Напружаная барацьба ішла і пры абмеркаванні агр. часткі праграмы. Ленін даў адпор анартыністам, якія адмаўлялі неабходнасць саюзу рабочага класа з сялянствам. З'езд зацвердзіў (38 галасамі) без істотных змен распрацаваную Леніным агр. частку праграмы, накіраваную на вызваленне шырокіх мас сялянства ад уціску прыгонніцтва і стварэнне больш спрыяльных умоў для разгортвання класавай барацьбы ў вёсцы, для вялучэння сялян на бок рэвалюц. пралетарыяту. Супраць асн. праграмнага патрабавання партыі на нац. пытанні выступілі бундаўцы і польскія сацыял-дэмакраты. Адпаведна з'езд прыняў патрабаванні аб праве нацый на самавызначэнне, аб інтэрнацыянальным прынцыпе набудовы пралетарскіх арг-цый, замацаваўшы ленінскую пазіцыю ў нац. пытанні. Такім чынам, на ўсіх праграмных палажэннях на з'ездзе перамаглі прыхільнікі рэвалюц. лініі. 50 галасамі з'езд прыняў праграму партыі, прапанаваную рэдакцыяй «Искры». Праграма дакладна вызначыла бліжэйшыя задачы сацыял-дэмакратыі (праграма-мінімум) — авалоданне самадзяржаўем, устанаўленне дэмакр. рэспублікі, знішчэнне рэштак прыгонніцтва ў вёсцы і канчатковыя меты (праграма-максімум) — ажыццяўленне сацыялізм. рэвалюцыі і устанаўленне дыктатуры пралетарыяту. Уперыню ў гісторыі міжнар. рабочага руху пасля смерці К. Маркса і Ф. Энгельса была прынята сапраўды марксісцкая рэвалюц. праграма. У рас. рабочым руху ідэйна перамог марксісцка-ленінскі кірунак. Ажыццяўляючы гэтую праграму, партыя паспяхова змагалася на перамогу бурж.-дэмакр. і сацыяліст. рэвалюцыі ў Расіі. Каб ідэйнае адзінства партыі замацаваць адзіствам арганізацыі, стварыць нормы і правілы ўнутр. жыцця партыі, Ленін прапанаваў праект Статута і выступіў на з'ездзе з дакладам аб Статуце партыі. Вакол ленінскіх арганіз. прынцыпаў набудовы партыі новага тыпу на з'ездзе разгарэлася жорсткая барацьба. Аснасцям рознагалосся быў перыяд параграф Статута — пра ўмовы членства ў партыі. Ленін і яго аднадумцы разглядалі марксісцкую партыю як перадавы, свядомы, арганізаваны атрад рабочага класа, які мае цвёрдую пралет. дысцыпліну, здольны ўзначаліць рэвалюц. барацьбу пралетарыяту і адзейсніць яго меты. Анартыністы імкнуліся стварыць рэфармісцкую, згодніцкую арг-цыю тыпу партый II Інтэрнацыянала. У ходзе жорсткіх спрэчак нявызначэнцы, прыхільнікі Мартава, аб'ядналіся з антыіскраўцамі. З'езд 28 галасамі супраць 22 (1 устрымаўся) прыняў 1-ы параграф Статута ў мартаўскай фармуліроўцы. Адпаведна астатнія пункты Статута «цвёрдым» іскраўцам удалося адстаяць і ў цэлым з'езд прыняў іскраўскі Статут. III з'езд РСДРП (1905) выправіў памылку II з'езду і прыняў ленінскую фармуліроўку 1-га параграфа Статута партыі. З'езд не прызнаў Бунда, як Бунд таго дамагаўся, адзіным прадстаўніком яўрэйскага пралетарыяту, тым самым адхіліў бундаўскі арганіз. нацыяналізм. У знак пратэсту бундаўцы пакінулі з'езд. З'езд пакінулі і 2 «эканамісты», калі іх заменены «Саюз рус. сацыял-дэмакратаў» не быў прызнаны прадстаўніком партыі за мяжой. Гэта амаль суадносіны сіл на карысць «цвёрдых» іскраўцаў. Пры выбарах цэнтр. органаў партыі іскраўцы перамаглі, а анартыністы апынуліся ў меншасці. З'езд канчаткова расколаў. Прыхільнікі Леніна, паслядоўныя рэвалюц. марксісты, якія атрымалі большасць галасоў, сталі называцца бальшавікамі, а праціўнікі Леніна, анартыністы, якія атрымалі меншасць галасоў, — меншавікамі. Найвялікшае гістар. значэнне з'езду ў тым, што на ім паспяхова завяршылася шматгадовая напружаная барацьба Леніна за стварэнне сапраўды рэвалюц. пралет. партыі, партыі са-

цыяліст. рэвалюцыі і дыктатуры пралетарыяту, партыі новага тыпу. «Бальшавізм,—адзначаў Ленін,— існуе, як плынь палітычнай мысьлі і як палітычная партыя, з 1903 года» (Тв., т. 31, с. 8).

Літ.: Ленін У. І. II з'езд РСДРП. Тв., т. 6 (Полн. собр. соч., т. 7); Ягоо Ж. Расказ аб II з'ездзе РСДРП.— Крок уперад, два крокі назад. Тв., т. 7 (Полн. собр. соч., т. 8); Второй съезд РСДРП. Июль — август 1903 года. Протоколы, М., 1959; История Коммунистической партии Советского Союза, т. 1, М., 1967, с. 446—531; Костин А. Ф. Ленин — создатель партии нового типа, М., 1970; Курс лекций по истории КПСС, ч. 1 (1883—1925 гг.), Мн., 1970. *М. І. Пахомаў.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД САВЕТАЎ ЗАХОДНІЙ ВОБЛАСЦІ, адбыўся 10—14.4.1918 у Смаленску. Прысутнічала 429 дэлегатаў, з іх 277 бальшавікоў, 69 эсэраў. Абмеркаваў пытанні: бягучы момант; даклады аб дзейнасці Аблвыкамзаха і СНК вобласці; аб расшырэнні тэрыторыі вобласці; аб арганізацыі Чырв. Арміі; выбары Выканкома; бягучыя справы (утварэнне СНГ, арганізацыя органаў Сав. улады, харч. пытанне). Прыняў рашэнне аб змяненні складу Заходняй вобл. (укл. Смаленская губ.) з цэнтрам у Смаленску. Выбраў Выканаўчы к-т (75 чал.). У прынятай дэкларацыі асудзіў контррэвалюц. дзейнасць бел. бурж. нацыяналістаў і заявіў пра непарыўную сувязь і салідарнасць працоўных Беларусі з рабочымі і сялянамі Сав. Расіі.

Літ.: Установление и упрочение Советской власти в Смоленской губернии. Сб. документов, Смоленск, 1957, с. 240—247; Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1968, с. 79—83; Комитеты бедноты Белоруссии. Сб. документов и материалов, Мн., 1958, с. 52—54. *А. В. Вараб'ёў.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД САВЕТАЎ СССР, адбыўся ў Маскве 26.1—2.2.1924. Прысутнічала 1540 дэлегатаў з рашаючым і 584 з дарадчым голасам, з іх 90% камуністаў.

Парадак дня: 1) Даклад ЦВК і СНК СССР (Л. Б. Каменеў); 2) Зацвярджэнне Канстытуцыі СССР (А. С. Енукідзе); 3) Бюджэт СССР (М. К. Уладзіміраў); 4) Аб стварэнні Цэнтр. с.-г. банка (А. Дз. Цюрупа і І. Т. Смілга); 5) Стварэнне ЦВК СССР — выбары Саюзнага Савета і зацвярджэнне Савета Нацыянальнасцей.

З'езд сабраўся ў дні ўсенароднай жалобы з выпадку смерці У. І. Леніна. На 1-м пасяджэнні, прысвечаным яго памяці, выступілі прадстаўнікі Камуніст. партыі, Камінтэрна, Урада СССР, рабочых, сялян і інтэлігенцыі, прыняты зварот «Да працоўнага чалавецтва». З мэтай ушанаваць памяць Леніна з'езд пастанавіў: аб'явіць 21 студз. днём жалобы; выдаць творы Леніна; пабудаваць Маўзалей Леніна на Краснай плошчы ў Маскве; перайменаваць Петраград у Ленінград; збудаваць помнікі ў сталіцы СССР і РСФСР — Маскве, у сталіцах саюзных рэспублік — Харкаве, Тыфлісе, Мінску, а таксама ў Ленінградзе і Ташкенце; стварыць спец. фонд імя Леніна для дапамогі беспрытульным дзецям — ахвярам вайны і голаду. У сувязі з пахаваннем Леніна з'езд перапыніў работу з 27 да 30 студз. З'езд ухваліў дзейнасць Урада СССР, прызнаў за неабходнае развіваць прадукцыйныя сілы краіны, абавязаў дзярж. ўстановы і прадпрыемствы садзейнічаць Наркамфіну ў заканчэнні грашовай рэформы, распачатай у 1922. Каб садзейнічаць планавану адноўленню с. гасп., з'езд пастанавіў стварыць Цэнтр. с.-г. банк. На пасяджэнні камуніст. фракцыі разам з беспарт. дэлегатамі заслуханы даклады аб вынніках XIII канферэнцыі РКП(б) (16—18.1.1924) і міжнар. становішчы. З'езд заслухаў таксама інфармацыю Наркамата замежных спраў аб прызнанні дэ-юрэ СССР Вялікабрытаніяй. 31 студз. зацвердзіў першую Канстытуцыю СССР і на яе аснове выбраў ЦВК СССР з 2 палат: Саюзнага Савета і Савета Нацыянальнасцей; выбраў ЦВК у складзе 414 чл. і 220 канд. у чл. Саюзнага Савета і 100 чл. Савета Нацыянальнасцей (70 чал. ад РСФСР, 5 ад УССР, 5 ад БССР, 20 ад ЗСФСР).

Літ.: Второй съезд Советов Союза Советских Социалистических Республик. Стенографический отчет, М., 1924; 2-ой съезд Советов Союза Советских Социалистических Республик. Постановления, М., 1924. *А. І. Марозава.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД САЛДАТ 2-й АРМІІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ надзвычайны, адбыўся 1—3 (14—16).11.1917 у Нясвіжы. Прысутнічала 211 дэлегатаў, пераважна бальшавікі. Абмеркаваў пытанні: аб перамозе Кастр. рэвалюцыі, бягучы момант, палітыка армейскага і франтавога к-таў, даклады з месцаў, выбары к-та. Аднадушна падтрымаў Сав. ўладу і ўхваліў яе першыя дэкрэты. Асудзіў контррэвалюц. дзейнасць Франтавога к-та і «Камітэта выратавання рэвалюцыі». Прыняў дэкларацыю аб рэвалюц. праванарадку ў арміі. У адозве «Да войск, якія ідуць на ўціхамірванне Петраграда» заклікаў салдат пераходзіць на бок Сав. улады. Выбраў ВРК арміі (12 чал., старшыня М. У. *Рагазінскі*, потым Р. І. *Берзін*), новы армейскі к-т (80 чал.). З'езд садзейнічаў перамозе і ўсталяванню сацыяліст. рэвалюцыі на прыфрантавой тэр. Беларусі.

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 2, Мн., 1957; Петров Н. Г. Большевики на Западном фронте в 1917 году. Воспоминания, М., 1959. *Д. М. Савіцкі.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД САЛДАТ 3-й АРМІІ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ, адбыўся 2—6(15—19).11.1917 у Полацку. Прысутнічала 450 дэлегатаў, з іх 155 бальшавікоў. Абмеркаваў пытанні: даклады з месцаў; бягучы момант; справаздача армейскага к-та 1-га скл.; выбары новага армейскага к-та. Значная частка дэлегатаў, у т. л. і некаторыя бальшавікі, стаяла на згодніцкіх пазіцыях па пытанні аб уладзе ў Расіі, таму з'езд прыняў рэзалюцыю пра неабходнасць стварыць кааліцыйны сацыяліст. ўрад. З'езд стварыў ВРК арміі і выбраў армейскі к-т (64 чал.) на чале з бальшавіком С. А. Анучыным, куды ўвайшло 29 бальшавікоў. *Трэці з'езд салдат 3-й арміі Заходняга фронту* (снеж. 1917) выправіў памылковыя пастановы з'езду.

Літ.: Победа Советской власти в Белоруссии. Мн., 1967, с. 341—346. *А. В. Вараб'ёў.* Мінск.

ДРУГІ З'ЕЗД САЛДАТ-СЯЛЯН ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ надзвычайны, адбыўся 11—15(24—28).12.1917 у Мінску. Прысутнічала 223 дэлегаты, з іх бальшавікоў 103. Абмеркаваў пытанні: дзейнасць Выканкома Усерас. Савета сялянскіх дэпутатаў 1-га скл.; зямельнае; харчовае; культ.-асветнае; бягучы момант; пра дэмабілізацыю арміі; адносіны да Устаноўчага сходу. Дэлегаты прызналі дзейнасць большасці Выканкома Усерас. Савета сялянскіх дэпутатаў злачынай у адносінах да прац. сялянства і выказалі яму недавер. На ўсіх пытаннях з'езд прыняў рэзалюцыі, якія поўнасцю падтрымліваліся Сав. ўладу. Дэлегаты ўхвалілі Дэкрэт аб зямлі і ўсе дэкрэты II Усерас. з'езду Саветаў, прынялі зварот да ўкр. народа аб барацьбе супраць контррэвалюц. Украінскай рады.

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 2, Мн., 1957, с. 519—529. *А. В. Вараб'ёў.* Мінск.

ДРУГІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ, гл. *Інтэрнацыянал 2-і.*

ДРУГІ НАКАЗАЛЬНЫ ТЭАТР (Другі чырвонаармейскі наказальны тэатр пры Палітаддзеле 16-й арміі), сфарміраваны ў Бабруйску ўвосень 1920. Кіраўнік С. Бахрах; акцёры Петраградскага нар. дома, рус. труп і ўдзельнікі самадзейнасці: Б. Быхоўскі, М. Дняпроў, В. Зярноў, Б. Няволін, А. Пакрасаў-Гецэвіч, Сакалоў-Панамароў, Фарасаў. У т-ры пачыналі творчую дзейнасць В. Барысевіч, К. Кулакоў (Рутштэйн), У. Уладамірскі, Я. Цікоцкі. Ставіў канцэртныя праграмы і спектаклі: «Жаніцьба» і «Рэвізор» М. Гогаля, «Беспасажніца» А. Астроўскага, «Барыс Гадуноў» А. Пушкіна, «Горкі лёс» А. Пісемскага, «Вяселле Крачынскага» А. Сухава-Кабылліна, «На дне» М. Горкага, «Патанулы звон» Г. Гаўптмана. У 1922 т-р спыніў дзейнасць.

С. А. Патровіч. Мінск.

ДРУГІ ПАХОД АНТАНТЫ, недакладная назва перыяду грамадз. вайны ў СССР з ліп. 1919 да лют. 1920 (разгром арміі Дзянікіна на Паўд. фронце, Юдзеніча ў р-не Петраграда, Калчака на Усх. фронце). У найноўшай перыядызацыі грамадз. вайны адхілена. Гл. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20.*

ДРУГІ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ, адбыўся 10—12.7.1933 у Мінску. Прысутнічала 630 дэлегатаў і дэлегацыя Заходняй вобл. РСФСР. Парадак дня: аб праполцы, уборцы і здачы абожка дзяржаве і задачы калгаснікаў (В. Ф. Шаранговіч). З'езд адкрыў старшыня СНК БССР М. М. Галадзед. У спрэчках па дакладзе выступілі старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў, сакратар ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікала, сакратар ЦК ЛКСМБ Л. Б. Герцовіч і інш. З'езд падвёў вынікі спаборніцтва ў час веснавой сяўбы і прэміраваў лепшыя раёны, сельсаветы, калгасы і калгаснікаў. Пераходны сцяг ЦК КП(б)Б атрымаў Слуцкі р-н. З'езд садзейнічаў мабілізацыі шырокіх калгасных мас і працоўных-адналасобнікаў на ўзорнае правядзенне ўборачнай кампаніі і дзярж. с.-г. нарыхтовак. Прыняў зварот да калгаснікаў і адналасобнікаў БССР аб разгортванні сацыяліст. спаборніцтва за датэрміновую ўборку і здачу збожжа дзяржаве і заключыў дагавор аб сацыяліст. спаборніцтве з Зах. вобласцю РСФСР.

У. У. Грамовіч. Мінск.

ДРУГІ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, адбыўся 13—17.12.1920 у Мінску. Прысутнічала 202 дэлегаты з рашаючым і 16 з дарадчым голасам.

Парадак дня: 1) Справаздача ВРК БССР (А. Р. Чарвякоў); 2) Бягучы момант і Сав. Беларусь (В. Г. Кнорын); 3) Аб сацыяліст. землеўпарадкаванні (А. С. Хаценка); 4) Аб харч. палітыцы ў Беларусі (І. А. Адамайціс); 5) Аднаўленне прамысловасці (А. І. Вайнштэйн); 6) Народная асвета (М. Я. Фрумкіна); 7) Сац. забеспячэнне (С. З. Кацэнбоген); 8) Арганізацыя Сав. улады на Беларусі (С. А. Мертэнс); 9) Аб правядзенні прац. павіннасці; 10) Аб рабоце каап. арг-цый; 11) Выбары ЦВК БССР і дэлегатаў на Усерас. з'езд Саветаў; 12) Бягучыя справы.

З'езд ухваліў работу ВРК БССР, прыняў дадаткі да Канстытуцыі БССР, у якіх вышэйшым органам улады рэспублікі аб'явіў з'езд Саветаў, а паміж з'ездамі — ЦВК БССР, выканаўчым органам — СНК БССР у складзе 15 наркаматаў. У рэзалюцыі па харч. пытанні аб'явіў дзярж. манаполію на асн. віды прадукцыі, цвёрдыя цэны, дзярж. нарыхтоўку і забеспячэнне насельніцтва прадметамі першай неабходнасці; падкрэсліў неабходнасць барацьбы са спекуляцыяй і неабходнасць ажыццяўлення поўнай нацыяналізацыі гандлю. У рэзалюцыі па нар. гаспадарцы вызначыў канкрэтныя задачы СНГ БССР на адноўленні прамысловасці і транспарту. Зацвердзіў «Тэзісы па аграрным пытанні», у якіх прадугледжваў новыя, сацыяліст. формы землекарыстання, надзяленне беззямельных і малазямельных сялян землямі былых памешчыцкіх гаспадарак, стварэнне саўгасаў. З'езд ратыфікаваў Рыжскі прэлімінарны дагавор ад 12.10.1920 і зацвердзіў мандат ВРК БССР аб перадачы сваіх паўнамоцтваў на вядзенне мірных перагавораў і падпісанне дагавору дэлегацыяй РСФСР. Прыняў зварот «Да працоўнага народа Беларусі», заклікаў рабочых і сяляні рэспублікі цясней згуртавацца вакол Камуніст. партыі і разам з братнімі народамі хутчэй адначыць нар. гаспадарку.

З'езд выбраў ЦВК БССР у складзе 60 чл. і 12 канд. і дэлегатаў на VIII Усерас. з'езд Саветаў.

Літ.: Съезды Советов Союза ССР, союзных и автономных советских социалистических республик. Сб. документов, т. 2, М., 1960, с. 239—261; Революционные комитеты БССР (июль — декабрь 1920 г.), Мн., 1957, с. 460—476.

М. І. Камінскі. Мінск.

ДРУГІ УСЕРАСІЙСКІ З'ЕЗД САВЕТАЎ рабочых і салдацкіх дэпутатаў, адбыўся 25—27.10(7—9.11).1917 у Петраградзе. Паводле звестак Бюро фракцый пры адкрыцці з'езду прысутнічала 649 дэлегатаў: 390 бальшавікоў, 160 эсэраў, 72 меншавікі, 14 аб'яднаных інтэрнацыяналістаў; ад Беларусі і салдатаў Зах. фронту 51 дэлегат, з іх 24 бальшавікі. У прэзідыум з'езду выбрана 14 бальшавікоў на чале з У. І. Леніным, 7 левых эсэраў і 1 ад укр. сацыялістаў.

Парадак дня: 1) Аб арганізацыі ўлады; 2) Аб вайне і міры; 3) Аб зямлі.

Бальшавікі выступілі на з'ездзе за перадачу ўсёй улады Саветам. За гэта галасавалі таксама левыя эсэры і меншавікі-інтэрнацыяналісты. Дэлегаты Мінскага, Віцебскага, Га-

радоцкага, Нясвіжскага, Рэчыцкага, Аршанскага, Слуцкага і інш. Саветаў перадалі з'езду патрабаванні сваіх выбаршчыкаў пра неадкладнасць пераходу ўсёй улады ў рукі Саветаў. Толькі Віцебскі губернскі, Магілёўскі гарадскі і Аршанскі раённы Саветы пад уплывам згоднікаў патрабавалі перадаць уладу кааліцыйнаму ўраду. У 3 *гадз* 10 *мін* 26 кастр. (8 ліст.) з'езд атрымаў вестку, што ўзяты Зімні палац і арыштаваны Часовы ўрад. Меншавікі, правыя эсэры і бундаўцы (каля 70 чал.) адмовіліся прызнаць сацыяліст. рэвалюцыю і пакінулі з'езд. З'езд прыняў напісаную У. І. Леніным адозву «Рабочым, салдатам і сялянам!», якая абвяшчала пераход улады ў рукі Саветаў. Вечарам 26 кастр., па дакладах У. І. Леніна з'езд прыняў *Дэкрэт аб міры* і *Дэкрэт аб зямлі*. Прыняў рашэнні: аб пераходзе ўлады на месцах да Саветаў; аб вызваленні арыштаваных Часовым урадам членаў земскіх к-таў; аб адмене пакарання смерцю на фронце; аб арышце Керанскага; аб барацьбе з контррэвалюц. выступленнямі; аб стварэнні ў арміі часовых рэўкомаў. У сваіх адозвах з'езд заклікаў працоўных забяспечыць рэвалюц. парадак на месцах, актыўна змагацца за ўладу Саветаў у тыле і на фронце. На з'ездзе створаны першы Сав. ўрад — Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з У. І. Леніным. У склад ВЦВК выбраны 101 чал., у т. л. 62 бальшавікі і 29 левых эсэраў. Сусветна-гістар. значэнне з'езду ў тым, што ён абвясціў устанаўленне на тэр. Расіі дыктатуры пралетарыяту, абвясціў органамі дзярж. улады ў цэнтры і на месцах Саветы рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў і гэтым даў пачатак новаму тыпу дзяржавы — Рэспублікі Саветаў.

Літ.: Ленін У. І. Другі Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў 25—26 кастрычніка (7—8 лістапада) 1917 г., Тв., т. 26 (Полн. собр. соч., т. 35); Второй Всероссийский съезд Советов рабочих и солдатских депутатов. Сб. документов, М., 1957; Декреты Советской власти, т. 1, М., 1957; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967.

І. І. Саладкоў. Мінск.

ДРУГІ УСЕСАЮЗНЫ З'ЕЗД КАЛГАСНІКАЎ-УДАРНІКАЎ, адбыўся 11—17.2.1935 у Маскве. Прысутнічала 1433 дэлегаты, ад БССР 35 дэлегатаў.

Парадак дня: аб прыкладным Статуце сельскагаспадарчай арцелі (Я. А. Якаўлеў). Для разгляду праекта Статута з'езд выбраў камісію в прадстаўнікоў усіх дэлегацый на чале з наркомам земляробства СССР М. А. Чарновым (167 чал.); ад БССР А. Р. Чарвякоў, Г. П. Сцешыц (Старобінскі р-н), К. Я. Кульба (Мінскі р-н), С. М. Сымон (Чырвонаслабодскі р-н), М. С. Сівагракаў (Быхаўскі р-н).

17 лют. з'езд зацвердзіў Статут і прапанаваў усім с.-г. арцелям у 3-месячны тэрмін на аснове прыкладнога Статута распрацаваць статуты сваіх арцеляў, абмеркаваць, зацвердзіць на агульных сходах і зарэгістраваць у райвыканкомах. Прыняты Статут дзейнічаў да 1969. З'езд звярнуўся з просьбай да ЦК ВКП(б) і СНК СССР арганізаваць у Маскве Усесаюзную с.-г. выстаўку (адкрыта 1.8.1939). Прыняцце Статута і замацаванне за калгасамі навечна зямель садзейнічалі канчатковай перамозе калгаснага ладу, яго далейшаму развіццю.

У. У. Грамовіч. Мінск.

ДРУГІ ФРОНТ у 2-й сусветнай вайне 1939—45, ваенныя дзеянні амер.-англ. войск супраць фаш. Германіі ў 1944—45.

Вялікабрытанія і ЗША абавязаліся адкрыць Д. ф. у 1942, каб раздзяліць узбр. сілы Германіі і адцягнуць значную іх частку з галоўнага сав.-герм. фронту. Аднак пад націскам імперыял. колаў, якія хацелі аслабіць адначасова Германію і СССР, каб пасля вайны ўстанавіць сваё панаванне ў Еўропе і ва ўсім свеце і не дапусціць Сав. Армію на Балканы, урады ЗША і Вялікабрытаніі ўсялякі зацягвалі адкрыццё Д. ф. Толькі летам 1943, калі стала відавочна, што СССР зможа адзін разграміць фаш. Германію, пачаліся падрыхтоўка да адкрыцця Д. ф. Англа-амер. войскі высадзіліся (6.6.1944) у Нармандыі (Пн Францыі). Д. ф. існаваў 11 месяцаў, меў пэўнае значэнне на апошнім этапе вайны. Але вырашальным у 2-й сусв. вайне заставаўся сав.-герм. фронт, на якім у 1945 дзейнічала больш як 60% герм. войск. Гл. таксама *Другая сусветная вайна 1939—45.*

«ДРУГІЯ», спец. партызанскі атрад НКДБ БССР, які ў Айч. вайну змагаўся супраць ням. акупантаў на Беларусі. 30.4.1942 атрад (43 чал.) перапраўлены ў варожы тыл. Камандзіры П. П. Качуеўскі, з 4.7.1942 Герой Сав. Саюза М. В. *Зябніцкі.* Спачатку дзейнічаў на тэр. Арлоўскай і Смаленскай абл., з лета 1942 у Бялыніцкім, Быхаўскім, Касцюковіцкім, Краснапольскім, Крычаўскім, Прапойскім р-нах Магілёўскай вобл., Кармянскім, Рэчыцкім, Рагачоўскім р-нах Гомельскай вобл., Брагінскім, Васілевіцкім, Калінкавіцкім, Хойніцкім р-нах Палескай вобл., Шчорскім р-не Чарнігаўскай вобл. У жн. 1943 на базе атрада «Д.» створаны 3 самастойныя спец. групы: «Уперад» (камандзір П. М. Салодкі), «Кроўныя» (камандзір М. І. Краўчанка), «Дняпро» (камандзір М. В. Сонцаў). Партызаны атрада «Д.» пусцілі пад адхон 8 варожых эшалонаў, у т. л. бронецягнік, знішчылі і пашкодзілі 33 аўтамашыны, узарвалі і спалілі 24 масты, разбурылі больш за 1,5 *км* чыг. палатна, каля 7 *км* тэлегр.-тэлефоннай сувязі, разграмілі 15 гарнізонаў. Здабывалі і перадавалі Сав. камандаванню каштоўныя звесткі пра размяшчэнне, перадыслакацыю, узбраенне праціўніка. У ліст. 1943 атрад злучыўся з Чырв. Арміяй.

І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак. Мінск.

ДРУГІЯ КАЗЛОВІЧЫ, вёска ў Якаўлевіцкім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Запаветы Ільіча». За 19 *км* на ПдУ ад Оршы, 101 *км* ад Віцебска. 322 ж., гасп. 106 (1971). Васьмігадовая школа, клуб.

«ДРУЖБА», спец. партызанская група НКДБ БССР на тэр. Беларусі ў Вял. Айч. вайну. 7.9.1943 група (7 чал.) перапраўлена ў варожы тыл. Камандзір І. А. Жолабаў. Вяла дыверсійную работу на тэр. Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.; у ліст. 1943 (налічвала 150 чал.) злучылася з Чырв. Арміяй. 6.4.1944 група «Д.» з 15 чал. зноў перапраўлена ў варожы тыл. Дзейнічала ў Дзятлаўскім і Шчучынскім р-нах Баранавіцкай вобл. У варожым тыле партызаны групы пусцілі пад адхон 22 эшалоны, разбілі і пашкодзілі 25 паравозаў, больш за 150 вагонаў і платформаў, 51 аўтамашыну, 2 танкі, узарвалі 4 масты, разбурылі 1 *км* чыг. палатна. 10.7.1944 група з 60 чал. злучылася з Чырв. Арміяй.

І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак. Мінск.

«ДРУЖБА НАРОДАЎ», гідраэлектрастанцыя каля воз. Дрысвяты ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Здадзена ў эксплуатацыю ў ліп. 1953. Магутнасць 300 *кВт.* Пабудавана працоўнымі Беларусі, Літвы, Латвіі. З 1964 уключана ў Беларускую энерг. сістэму.

ДРУЖКІ (*баяры, панібрацці, брусні*—у жаніха; *баяркі, сняданкі*—у нявесты), вясельныя чыны. Для ўдзелу ў вясельным абрадзе па 2—3 Д. запрашаюцца маладымі з ліку сваякоў і сяброў.

У мінулым Д. ўваходзілі ў асобныя дружыны (дружбы). Старшы Д. ў жаніха (старшы баярын, паджыжы, паджанішнік, шафер) і старшая дружка ў нявесты (бальшáнка, падняvесніца, старшая друхна, шаферка) поруч са сватам былі распарадчыкамі вясельнага рытуалу, жартаўнікамі. Для Д. падбіралі найб. гаварких і вясёлых сярод гасцей.

ДРУЖЧЫЦ Васіль Данілавіч [27.1(8.2).1886, в. Блудзень Пружанскага пав. Гродзенскай губ.— 20.12.1937], беларускі савецкі гісторык, праф. (1927). З сялян. Скончыў Юр'еўскі ун-т (1911). У 1911—22 настаўнік гісторыі ў Літве і на Беларусі. З 1922 выкладчык БДУ, з 1933 супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР, праф. гісторыі народаў СССР у Літаратурным ін-це імя Герцэна (Масква). Даследаваў гісторыю Беларусі эпохі феадалізму, пераважна магдэбургскае права ў гарадах Беларусі 15—18 ст. Вывучаў гісторыю бел. друкарства.

Тв.: Палажэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы пасля Люблінскай уніі, «Працы БДУ», 1925, № 6—7; Места Минск у конца XV і начатку XVI ст., там жа, 1926, № 12; Войты і іх улада ў беларускіх гаспадарскіх местах з майдэборскім правам, «Запіскі Аддзела гуманітарных навук», 1928, кн. 3.

Я. М. Карпачоў. Мінск.

ДРУЖЫЛАВІЧЫ, вёска ў Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Бальшавік». За 10 *км* на Пн ад Іванава, 142 *км* ад Брэста, 10 *км* ад чыг. ст. Янаў-Палескі, на шашы г. п. Іванава — в. Моталь. 522 ж., гасп. 157 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, магазін. Вядомая з 16 ст.

ДРУЖБІНА, 1) у найбольш старадаўнім значэнні — таварыства, згуртаванне, аб'яднанне людзей. 2) Атрад воінаў-прафесіяналаў, якія служылі ў правадыроў плямёнаў, князёў, каралёў.

У стараж. германцаў Д. вядома з 1 ст. да н. э. Садзейнічала ўзвышэнню правадыра племені і тым самым узмацненню каралеўскай улады. Д. былі і ў буйных землеўладальнікаў. З развіццём феадалізму ў Зах. Еўропе Д. як войск. адзінка заменена феад. апалчэннем сеньёра. У Кіеўскай Русі (з 9 ст.) і стараж.-рус. княствах Д. падзяляласа на старэйшую і малодшую. Старэйшыя дружыннікі былі дарадчыкамі князя, выконвалі адм. і судовыя функцыі, камандавалі войскам, малодшыя служылі ў войску, збіралі даніну. Паступова дружыннікі набывалі зямлю і склалі аснову класа феадалаў.

Літ.: Греков Б. Д. Киевская Русь, М., 1953; Юшков С. В. Общественно-политический строй и право Киевского государства, М., 1949.

А. П. П'янкоў. Мінск.

ДРУЖБІНА Паліна Васілеўна (н. 1.6.1927, в. Палоева Чавускага р-на Магілёўскай акр.), беларуская савецкая спявачка (мецца-сапрана). Засл. арт. БССР (1964). Скончыла Бел. кансерваторыю (1955). З 1957 салістка Бел. т-ра оперы і балета. З партый: Марына («Яснае світанне» А. Туранкова), Графіня і Паліна («Пікавая дама» П. Чайкоўскага), Любаша («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Канчакоўна («Князь Ігар» А. Барадзіна), Азучэна, Амнерыс, Ульрыка («Трубадур», «Аіда», «Баль-маскарад» Дж. Вердзі).

ДРУЖЫНІН Міхаіл Іванавіч (н. 16.9.1920, в. Дзям'янцава Бежацкага пав. Цвярской губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945), ген.-м. (1965). Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен. акадэмію Ген. штаба (1962). Вызначыўся 23.6.1944 пры вызваленні Віцебскай вобл. На чале стралк. батальёна першы падняўся ў атаку; з 4 байцамі заханіў пераправу цераз Лучосу і ўтрымліваў яе да падыходу асноўных сіл. Служыць у Сав. Арміі.

ДРУЗА (ням. Druse), шчотка, зростак крышталяў, прымацаваных толькі адным канцом да субстрата. Утвараецца звычайна на сценках пустот у горных пародах (гл. *Жэода*). Д. характэрныя многім мінералам (кварцу, кальцыту і інш.).



Друза горнага хрусталю.

ДРУПКА, рака, левы прыток Зах. Дзвіны. Даўж. 52 *км.* Пачынаецца з воз. Дрывяты, цячэ праз азёры Цно, Неспіш і Недрава ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Вадазбор (1050 *км*²) пераважна ў межах Браслаўскай грады. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 8,7 *м*³/*сек.* На Д. пабудавана Браслаўская ГЭС. Каля ўпадзення ракі ў Зах. Дзвіну г. п. Друя.

ДРУЙСК, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на р. Друйка. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Суворава. За 21 *км* на ПнУ ад Браслава, 230 *км* ад Віцебска, 19 *км* ад чыг. ст. Друя, на шашы Браслаў — г. п. Друя. 268 ж., гасп. 99 (1971). Лясніцтва, цагельня. За 0,5 *км* ад Д. Браслаўская ГЭС, за 2 *км* смалакурны завод Полацкага хімлясгаса. 2 клубы, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Ням.-фаш. захопнікі загубілі ў вёсцы 240 сав. грамадзян.

ДРУК, перыядычныя (газеты, часопісы, альманахі) і неперыядычныя (кнігі, брашуры, плакаты) выданні; сродак прапаганды паліт. і навук. ведаў, паліт. барацьбы, з дапамогай якога фарміруецца грамадская думка. У капіталіст. грамадстве выкарыстоўваецца для абароны класавых інтарэсаў буржуазіі, з'яўляецца рупарам рэакц. ідэалогіі. Сав. Д.— магутная зброя камуніст. выхавання мас, прапаганды ідэй марксізма-ленінізма і пралет. інтэрнацыяналізму. Асн. яго рысы — партыйнасць, праўдзівасць, класавасць, ідэйнасць, адданасць справе Леніна, народнасць, непрымірымасць да праяў бурж. аб'ектывізму, рэвізіянізму, апартунізму, апалітычнасці.

Кнігадрукаванне пашырылася ў Зах. Еўропе з 40-х гадоў 15 ст., калі І. Гутэнберг у Майнцы (Германія) вынайшаў рухомыя метал. літары.

Пачатак бел. кнігадрукавання звязаны з дзейнасцю Францыска Скарыны, які выдаў у Празе ў 1517 «Псалтыр», пераклаў на бел. мову і выдаў у 1517—19 Біблію, надрукаваў у Вільні ў 1525 «Апостала» і «Малую падарожную кніжыцу». Першая друкарня на Беларусі з'явілася ў Брэсце (1563), дзе друкаваліся кнігі на лацінскай і польскай мовах. На тэр. сучаснай Беларусі першая кніга на старажытнай бел. мове выдадзена ў 1562 у Нясвіжы. З канца 17 ст. культура бел. народа душылася польскімі феадаламі. Ува'ходзіла ў склад Расіі ў канцы 18 ст. садзейнічанне Беларусі ў Расіі ў канцы 18 ст. садзейнічанне ўмацаванню культ. сувязей паміж бел. і рус. народамі. Кнігавыдавецкая справа на Беларусі пачатку развіцця да Кастр. рэв. не набыла. Толькі ў пач. 20 ст. арганізоўваюцца асобныя бел. выдавецтвы — *«Дабраляне сонца і ў наша вакончае»* (1906, Пецярбург), *Беларускае выдавецкае таварыства* ў Вільні (1909), выдавецтва Антона Грыневіча ў Пецярбургу (1910) і інш. З 1835 да 1917 выпушчана 320 назваў кніг на бел. мове; друкаваліся яны кірыліцай і лацінкай. У 1910 на Беларусі было 123 дробныя друкарні. Першае перыяд. выданне на тэр. Беларусі — *«Газета Гродзеньска»* («Gazeta Grodzieńska»), выходзіла у 1776—83 у Гродне на польскай мове. Перыядычны Д. на Беларусі да Кастр. рэв.— пераважна афіц. газеты, якія выходзілі на рус. мове, прыватныя і царкоўныя выданні. З 1838 у губернях выдаваліся *«Губернские ведомости»*. Іскрывал старонка ў гісторыі бел. Д.— выданне К. Калюскім у 1862—63 нелегальнай газ. *«Мужыцкая праўда»* («Mużyckaja prafda»). Першая легальная грамадска-паліт. газета ліберальна-бурж. кірунку на Беларусі *«Минский листок»* (1880—1902). У 1902—05 не лепшыя традыцыі працягвала газета прагрэс. кірунку *«Северо-Западный край»*. У 1906 выходзіць першая легальная прагрэсіўная газ. на бел. мове *«Наша доля»*, у 1906—15 — бурж.-ліберальная газ. на бел. мове *«Наша ніва»*. З'яўляюцца часопісы на бел. мове — месячнік с. гасп. *«Сяха»* (1912—15), час. для юнацтва *«Лучынка»* (1914).

С.-д. арг-цыі распаўсюджвалі газ. «Искра», якая дала пачатак шырокаму развіццю ў Расіі, у т. л. на Беларусі, *бальшавіцкага друку*, і інш. выданні. Групамі РСДРП у 1904—05 ствараліся падпольныя друкарні ў Мінску, Гомелі, Гродне, Магілёве, Бабруйску і інш. гарадах Беларусі, у якіх наладжваецца выпуск бальшавіцкіх лістовак, адозваў, перыядычных выданняў (гл. *Падпольныя друкарні РСДРП*). Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 у Мінску, Віцебску, Магілёве, Мазыры, Полацку, Оршы, Клімавічах і інш. гарадах выходзяць газеты Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў — *«Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов»*, *«Известия Мозырского Совета рабочих и солдатских депутатов»* і інш. Першая легальная масавая бальшавіцкая газ. на Беларусі «Звезда» (гл. *«Звязда»*) пачала выходзіць у Мінску з 27.7 (9.8).1917 (арганізатары і першыя рэдактары М. В. Фрунзе, В. Г. Кнорын, А. Ф. Мясніков, В. В. Фамін, К. І. Ландар). Часовы ўрад закрываў газету, але яна ўзнаўляла выхад над назвамі *«Молот»*, *«Буревестник»*. Дарэвалюц. бальшавіцкія выданні былі магутным сродкам прапаганды марксісцкай тэорыі, выяўлялі гніласць бурж.-памешчыцкага ладу, паказвалі сапраўдныя шляхі рэвалюц. пераўтварэння Расіі.

Пралет. дыктатура закрыла ўсе контррэвалюц. бурж. газеты. Сав. друк з'яўляецца выразнікам інтарэсаў рабочага класа, сродкам паліт. асветы мас, калектыўным прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам. Гісторыя партыйна-сав. Д. на Беларусі непарыўна звязана з гісторыяй Камуніст. партыі Беларусі. У 1918—19 у Маскве выходзіла першая савецкая газета на беларускай мове *«Дзянніца»*. У 1920, пасля выгнання польскіх інтэрвентаў, у рэспубліцы выдавалася 27 газет, 15 часопісаў і інш. перыяд. выданняў. У гады аднаўлення і развіцця нар. гасп. кнігавыдавецкая і газетная справа на Беларусі набыла шырокае развіццё. Ствараецца Дзярж. выдавецтва БССР (гл. выд-ва *«Беларусь»*) і шэраг інш. Выходзяць спец. газеты і часопісы — для рабочых, для моладзі, прафсаюзныя, с.-г., літаратурныя. У 1922 арганізавана Вол. адда. Расійскага тэлегр. агенцтва (з 1931 *Тэлеграфнае агенцтва Беларускай ССР*). У 30-я г. ў СССР, у т. л. ў БССР, ствараюцца раённыя газеты. На прадпрыемствах, будоўлях і ў навуч. установах шырока развіваецца шматтыражны Д. У Зах. Беларусі да 1939 выходзілі падпольныя камуністычныя газеты і часопісы (гл. *Падпольны перыядычны друк КПЗБ*). У 1940 у БССР выходзіла 252 газеты разавым тыражом больш як 1 млн. экз.; 19 часопісаў разавым тыражом 750 тыс. экз. З 1918 да 1941 выдадзены 15 662 кнігі тыражом 127 773 тыс. экз. У Айч. вайну Д. намагаў Камуніст. партыі мабілізаваць сав. народ на барацьбу з ням.-фаш. захопнікамі. У акупаваныя раёны рэспублікі засылаліся газ. *«Савецкая Беларусь»*, *«За Савецкую Беларусь»*, *«За свабодную Беларусь»*, *«Віцебскі рабочы»*, якія выдаваліся ў прыфрантавой паласе, перыяд. выданні *«Раздавім фашысцкую гадзіну»*, *«Партызанская дубінка»*, «Блокнот агітатора-партызана», цэнтр. газеты. Ням. акупанты знішчылі ўсю палігр. базу рэспублікі, але ў цяжкіх умовах партыйна-патрыятычнага і партыз. падполля было наладжана выданне 162 газет (гл. *Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі*). У пасляваенныя гады палігр. база рэспублікі поўнасцю адноўлена.

У 1970 у СССР выпускалася каля 9 тыс. газет на 57 мовах народаў СССР і 8 замежных. У 1970 выходзіла 1204 часопісы, выдадзена 78 875 кніг і брашур агульным тыражом 1 309 648 тыс. экз. У БССР у 1970 выйшла 2174 кнігі і брашуры тыражом больш за 25 млн. экз.; з 1917 да 1970 выдадзена 103 кнігі твораў К. Маркса і Ф. Энгельса тыражом 823 тыс. экз. і 386 кніг У. І. Леніна тыражом 4227 тыс. экз. У перакладзе на бел. мову выйшлі «Капітал» К. Маркса, Творы У. І. Леніна. У 1970 выходзілі 102 часопісы і інш. перыяд. выданні разавым тыражом 1461 тыс. экз. (гадавы тыраж 25 702 тыс. экз.); выдавалася 175 газет (у т. л. 132 на бел. мове) разавым тыражом 4057 тыс. экз. (гадавы тыраж больш за 665 млн. экз.). Гл. таксама *Газета, Кніга, Часопіс*.

Літ.: Ленин В. И. О печати, М., 1959; О партийной и советской печати. Сб. документов, М., 1954; Советская печать в документах, М., 1961; Печать СССР за 50 лет, М., 1967; Из истории партийно-советской печати Белоруссии, Мн., 1960; Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967; Федченко П. М. Преса та її попередники. Історія народження й основні закономірності розвитку, Київ, 1969.

С. В. Марцялёў. Мінск.

ДРУКАРНЯ, прадпрыемства паліграфічнай прамысловасці, якое выпускае розныя віды друкарскай прадукцыі. Бываюць цэнтральныя, рэспубліканскія, абласныя, раённыя і нетамасныя; па відах прадукцыі — кніжныя, газетныя, кніжна- і газетна-часопісныя, універсальныя, бланачныя і інш.

Д. маюць цэхі: фармныя (наборны, стэрэатыпны, цынкаграфічны), друкарскія (плоскадрукарскі, ратацыйны), аддзелачныя (брашураванча-пераплётны), дапаможныя (напр., рамонтна-механічны) і інш. У Д. могуць уваходзіць не ўсе віды цэхаў (напр., толькі наборны і плоскадрукарскі цэхі). Паліграф. прадпрыемствы, на якіх ужываюцца розныя віды друку, наз. камбінатамі, кніжнымі фабрыкамі, тыпалітаграфіямі і інш. Найбольшы ў БССР *Мінскі паліграфічны камбінат*. Гл. таксама *Кніжадрукаванне, Друкарня выдавецтва ЦК КПБ*.

ДРУКАРНЯ ВЫДАВЕЦТВА ЦК КПБ, паліграф. прадпрыемства ў БССР.

Засн. ў снеж. 1917 на базе друкарні былога Мінскага губ. праўлення і дробных прыватных друкарняў. Мела назвы: 1-я Савецкая друкарня, з 1935 друкарня імя Сталіна, у 1954—69 «Звязда». Да Айч. вайны тут друкаваліся рэсп. газеты, паліт. л-ра, творы бел. пісьменнікаў, падручнікі. У Айч. вайну паліграфісты друкарні па заданні Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б наладзілі выпуск нелегальных выданняў: лістовак, перыяд. лістка *«Вестник Родины»*, № 1—4 газ. *«Звязда»* і інш.; намагалі стварацъ друкарні ў партыз. атрадах. Паліграф. база друкарні, амаль поўнасцю знішчаная нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пасля вайны адноўлена.

Друкуе (1971) 29 газет (агульны разавы тыраж больш за 4,5 млн. экз.), у т. л. 13 рэсп. газет, абл. газ. «Мінская праўда», гарадскую газ. «Вячэрні Мінск» (на бел. і рус. мовах), цэнтр. газеты «Правда», «Комсомольская правда», «Известия» з дадаткам штотыднёвіка «Неделя», «Сельская жизнь», «Труд», «Литературная газета», «Советский спорт», «Социалистическая индустрия», «Советская торговля», «Учительская газета» (перадаюцца па фотатэлеграфе, а таксама друкуюцца з матрыц, якія дастаўляюцца з Масквы самалётамі); 27 часопісаў (агульны разавы тыраж каля 3 млн. экз.), у т. л. 8 рэспубліканскіх. Узнаг. ордэнам Працоўн. Чырв. Сцяга (1971).

І. Л. Матуль. Мінск.

ДРУКАРСКАЯ МАШЫНА (паліграфічная), машына, на якой атрымліваюць адпаліткавыя адбіткі тэксту, ілюстрацый і г. д. (друкуюць кнігі, газеты, часопісы, плакаты, бланкі).

Д. м. падзяляюцца на тыгельныя, плоскадрукавальныя і ратацыйныя (гл. рыс.). Паводле спосабу друкавання адрозніваюць Д. м. для высокага, глыбокага і плоскага друку. Ва ўсіх тыпах Д. м. фарба перадаецца на паперу пад ціскам у адпаведнай друкарскай формы; схемы друкавання залежаць ад віду друку (гл. *Глыбокі друк, Высокі друк, Плоскі друк*). Сучасныя ратацыйныя Д. м. прадукцыйнасцю да 100 тыс. экз. 4-старонкавых газет за гадзіну. Гл. таксама *Паліграфічная прамысловасць* і *Кніжадрукаванне*.




Схема друкарскага апарата: *а* — тыгельнага, *б* — плоскадрукавальнага, *в* — ратацыйнага; *1* — друкарская форма, *2* — прыцісная паверхня.

Літ.: Морозов М. Г. Печатные машины, в. 1—4, М., 1962—67; Урнов К. В. Электрооборудование полиграфических машин, 2 изд., М., 1967.

ДРУКАРСКАЯ МАШЫНА (тэкстыльная), машына, якою наносяцца на тканіну фарбавыя ўзоры (малюнкі). Асн. часткі: металічны цыліндр, на які намотваецца тканіна, і друкавальны вал з гравюраю.

Пры друкаванні тканіна прыціскаецца да вала і фарба з гравюры перадаецца на тканіну. Д. м. бываюць з адным або некалькімі (да 16) валамі (для шматфарбавага друку). Прадукцыйнасць 25—160 м/мін.

ДРУКЕР Соф'я Юр'еўна [н. 25.12.1906 (7.1. 1907), м. Копысь Горацкага пав. Магілёўскай губ.], беларуская савецкая спявачка (драм. сапрана). Нар. арт. БССР (1955). У 1930 скончыла Бел. муз. тэхнікум (клас В. Цвяткова), вучылася ў Вел. студыі оперы і балета ў А. Ваначыча (1930—32), у Бел. кансерваторыі (1932—36, клас П. Ціханава). У 1933—41 і з 1944 салістка Бел. т-ра оперы і балета (у Айч. вайну ў Саратаўскім т-ры оперы і балета, удзельніца франтавых канцэртных брыгад). Першая выканала партыі Аўгінні («У пушчах Палесся» А. Багатырова), Рагнеды Янаўны («Калючая ружа» Ю. Семяняк). З роляў у класічных операх: Яраслаўна («Князь Ігар» А. Барадзіна), Ліза, Марыя («Пікавая дама», «Мазепа» П. Чай-





С. Ю. Друкер у ролі Тоскі.

коўскага). Наташа («Русалка» А. Даргамыжскага), Тоска («Тоска» Дж. Пучыні), Аіда («Аіда» Дж. Вердзі), Часнікова («Страшны двор» С. Манюшкі). У Д. моцны голас вял. дыяпазону, прыгожага тэмбру; створаныя ёю вобразы драматычна напружаныя, багатыя псіхалагічнымі нюансамі. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Літ.: Жураўлёў Д. Соф'я Друкер, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.

І. Г. Пісневіч. Мінск.

ДРУМЛІНЫ (англ. ад. лік drumlin), прадаўгавата-авальныя ўзгоркі выш. 5—25 *м*,

вроўку да 100 *м*, даўж. да 2,5 *км*, шыр. 100—200 *м*. Арыентаваны пераважна з Пн на Пд або з ПнЗ на ПдУ. Пашыраны ў абласцях чацвярцічных мацерыковых абледзяненняў. Бываюць групамі з унутр. боку градаў канцовых марэн, утвараюць друмлінавы рэльеф. Тыповыя друмлінавыя ландшафты характэрныя Швецыі, Фінляндыі, Карэльскай АССР. Трапляюцца Д. ў Эстоніі, на Пн Беларусі.

Кожны Д. складаецца з ядра і марэннай абалонкі. Ядро (барановы лоб, скала, вялікі валун, слаістыя водналедавіковыя адклады) звычайна знаходзіцца ў пярэдняй, больш стромкай і шырокай частцы. Суцэльная або перарывістая абалонка, складзеная з марэннага матэрыялу, утварылася ў час наступання ледавіка пры тармажэнні часткі лёду сустрэтай перашкодай.

ДРУМО (Drumaux) Марк (н. 10.5.1922, г. Ат), дзеяч бельгійскага рабочага руху. З рабочых. Удзельнік антыфаш. Руху Супраціўлення. Чл. кампартыі Бельгіі (КПБ) з 1942. Пасля вызвалення краіны ад ням. акупантаў адзін з рэдактараў цэнтр. органа КПБ газ. «Le Drapeau Rouge» («Чырвоны сцяг»). З 1957 чл. ЦК, з 1960 чл. Палітбюро ЦК КПБ. У 1963—65 чл. сакратарыята ЦК КПБ. З 1961 дэпутат парламента. З снеж. 1966 пам. старшыні, з вер. 1968 старшыня партыі. Узначальваў дэлегацыі КПБ на міжнар. Нарадзе камуніст. і рабочых партый у Маскве ў 1969 і на XXIV з'ездзе КПСС.

ДРУСКІНІНКАЙ, бальнеалагічны курорт у паўд. частцы Літ. ССР, на правым беразе Нёмана, сярод хваёвага лесу, за 130 *км* ад Вільнюса, 45 *км* ад Гродна.




Друскінінкай. Санаторый «Беларусь».

Звесткі пра Д. вядомыя з 1789. Лячэбная ўстанова заснавана ў 1837. Зіма ў Д. з сярэдняй т-рай студз. −5 °С, лета цёплае, з сярэдняй т-рай у чэрв. 18 °С. Асн. лекавыя фактары — мінер. крыніцы з хларыдна-натрыева-кальцыевымі водамі (для ванн, інгаляцый і піцця) і лекавая грязь. У Д. 7 санаторыяў для дарослых, 2 дзіцячыя (у т. л. 2 санаторыі Міп-ва аховы здароўя БССР: агульнатэрапеўтычны для дарослых на 100 ложкаў і для дзяцей, хворых на рэўматызм, і з астаткавымі з'явамі поліміэліту на 300 ложкаў), дом адпачынку. Лечаць хваробы органаў руху, крывазвароту, стрававання, нервовай сістэмы. Сезон — увесь год.

Літ.: Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967; Юшенайте Я. и Медонис А. Курорт Друскининкай, 2 изд., Вильнюс, 1962.

Л. Ф. Калітоўскі. Мінск.

ДРУЦК (летапісны Дрютеск, Друтеск, Друческ), стараж. горад Полацкай зямлі, цэнтр *Друцкага княства*.



Гарадзішча старажытнага Друцка.

Узнік у вярхоўях Друці ў пачатку волака адтуль у адгалінаванняў дзвінскага шляху з «варагаў у грэкі». Упершыню ўпамінаецца ў летапісе пад 1092, паводле Навучання Манамаха, існаваў у 1078. Пасля смерці полацкага кн. Усяслава Брачыславіча стаў удзелам яго сыноў і адыграў вялікую ролю ў іх барацьбе з мінскімі Глебавічамі за полацкі трон. У канцы 12 ст. адышоў да Смаленска, а ў сярэдзіне 13 ст. да Вял. кн. Літоўскага. У 14 ст. ў Д. існаваў сабор, які, паводле запісу ў Друцкім евангеллі, пабудаваны ў 1001 і з'яўляўся адным з самых стараж. не толькі на Беларусі, але ва ўсёй Кіеўскай Русі. Прычына гібелі Д. не высветлена. Горад, відаць, загінуў пры асадзе ад пажару ў канцы 15 — пач. 16 ст. і больш не аднаўляўся. Даследаваўся А. Да. Каваленем (1930), Л. В. Аляксеевым (1956—62, 1965, 1967).

Гарадзішча Д.— дзядзінец і вакольны горад, умацаваныя валамі і равамі,— сляды неўмацаванага пасаду і курганнага некропаля. Пры раскопках выяўлены дзве перакрыжаваныя вуліцы, брукаваныя дрэвам, рэшткі драўляных пабудоў, вызначана сацыяльная тапаграфія дзядзінца (княская і рамесная часткі Д. і гарадская плошча). Багатая матэрыяльная культура (зброя, прылады працы, ліцейныя формы, шматлікія ўпрыгожанні, прасліцы з надпісамі і інш.) сведчыць пра развіццё рамяства, пісьменнасці, гандлю з Кіевам, Смаленскам, Валынню, Прыбалтыкай, Візантыяй.

Л. В. Аляксееў. Масква.

ДРУЦК, вёска ў Воўкавіцкім с/с Талачынскага р-на Віцебскай вобл., на левым беразе р. Друць, паблізу дзядзінца стараж. горада Друцк. Цэнтр калгаса «Праўда». За 10 *км* на ПдУ ад Талачына, 134 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Талачын, каля шашы Талачын — г. п. Круглае (1 *км*). 328 ж., гасп. 73 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ДРУЦКАЕ КНЯСТВА, удзельнае княства. Узнікла ў бас. р. Друці. Цэнтр — Друцк. Вядомае як самастойнае з 1-й пал. 12 ст. пасля распаду Полацкай зямлі. На чале Д. к. сталі пераважна нашчадкі полацкага князя Усяслава Брачыславіча — князі Барысавічы. Іх улада была абмежаваная вечам і баярскай радай.

Паводле Іпацьеўскага летапісу, у 1159 друцкае веча прагнала князя Глеба, сын якога Расціслаў займаў трон у Полацку, і запрасіла да сябе другога ўнука Усяслава — Рагвалода Барысавіча (у хрышчэнні Васіль). Пры ім тэр. Д. к. павялічылася. Адзін час ён нават займаў трон у Полацку, але ў 1162 зноў вярнуўся ў Друцк. У 2-й пал. 12 ст. друцкія князі валодалі і мінскімі за полацкі трон.

Рагвалод Барысавіч, а потым яго сын Глеб заключылі саюз з смаленскімі князямі. У 1180 Д. к. было ўцягнута ў барацьбу смаленскіх князёў з чарнігаўскімі. Князь Ігар Святаславіч (герой «Слова аб палку Ігаравым») разам з інш. князямі пачаў паход супраць Д. к., але ўцяць Друцк не здолеў. У 13 ст. Д. к. ўвайшло ў склад Вял. кн. Літ., але доўга захоўвала сваё асобнае становішча, аямельныя ўладанні і ўладу. Мясцовыя князі знаходзіліся ў Д. к. да 1508. Гл. *Друцкія*.

Літ.: Алексеев Л. В. Полоцкая земля, М., 1966; Хроника Быховца, М., 1966; Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 1 (т. 1—2), М., 1962.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

ДРУЦКАЎШЧЫНА, вёска ў Сноўскім с/с Нясвіжскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр эксперым. элітна-насенняводчай гаспадаркі «Друцкаўшчына» Мін-ва с. гасп. БССР. За 30 *км* на З ад Нясвіжа, 120 *км* ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Пагарэльцы. 523 ж., двароў 102 (1971). Лесапільня, кузня, сталярн. майстэрня. Клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, магазін.

ДРУЦКІ-ПАДБЯРОЗКІ Рамуальд Андрэевіч, гл. *Падбярэскі* Р. А.

ДРУЦКІЯ, беларускі княскі род, нашчадкі полацкіх князёў. Родапачынальнік — полацкі князь Рагвалод Барысавіч [1144—1151, 1158—1162], які валодаў *Друцкім княствам* (адсюль прозвішча яго нашчадкаў).

У 1-й пал. 14 ст. Д. падзяліліся на 2 лініі: старэйшую (ад кн. Васіля Міхайлавіча), прадстаўнікі якой удзельнічалі ў паўстанні М. Глінскага і ў 1508 выехалі ў Маскву, і малодшую (ад кн. Сямёна Міхайлавіча), прадстаўнікі якой асталіся ў Вял. кн. Літ. і падзяліліся ў 15 ст. на некалькі галін, атрымаўшы прозвішчы ад сваіх маёнткаў (Друцкія, Д.-Любецкія, Д.-Сакалінскія, Д.-Азярэцкія, Д.-Горскія, Д.-Багрынаўскія, Д.-Зубрэвіцкія, Д.-Прыхабскія, Д.-Галычанскія, Д.-Падбярэскія, Д.-Відзінецкія, Д.-Талачынскія) і ад прозвішчаў родапачынальнікаў асобных галін роду (Д.-Бабічавы, Д.-Адынцовічы, Д.-Каноплі, Д.-Пуцяцiны). Найбольш вядомыя: Д.-Сакалінскія, якія ў 17 ст. займалі пасады ваяводаў полацкіх, каштэлянаў Полацка, Мсціслава, Віцебска і інш.; Друцкі-Горскі Рыгор, мсціслаўскі ваявода ў 1650—59; Друцкі-Любецкі Францішак Ксавер (1779—1846), міністр фінансаў Царства Польскага (1821—30), чл. Дзярж. савета Расіі з 1832.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ДРУЦЬ, рака, правы прыток Дняпра. Даўж. 295 *км*. Пачынаецца на выш. 220 *м* над узр. м., за 2 *км* на ПнЗ ад в. Мураўнічы ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл. Цячэ па тэр. Круглянскага, Бялыніцкага, часткова Магілёўскага, Клічаўскага, Быхаўскага, Кіраўскага р-наў Магілёўскай вобл. і Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Упадае ў Дняпро каля Рагачова на выш. 124,7 *м* над узр. м. Рэльеф вадазбору (5020 *км*²) плоскі, у паўн. частцы ўзгорысты (*Аршанскае ўзвышша*). Лясістасць каля 35%. У верхнім цячэнні шыр. далiны 0,1—0,3 *км*, у сярэднім і ніжнім 1,5—2, месцамі да 2,5 *км*. Схілы далiны ў вярхоўі пераважна стромкія, у нізоўі спадзістыя. Рэчышча моцна звілістае, дробіцца на рукавы; шмат заток і старых рэчышчаў. Найб. прытокі: Крывая, Няропля, Вабіч, Арлянка, Балонаўка, Грэза (злева), Аслік, Малыш, Даўжанка, Вепрынка, Белая (справа). Жыўленне мяшанае: снегавое, дажджавое, грунтавое. Ледастаў з канца снеж. да пач. крас. ў верхнім цячэнні, з пач. снеж. да канца сак. ў ніжнім. Сярэдні гадавы расход вады каля вусця 31,6 *м*³/*сек*. Суднаходная ў паўнаводны перыяды ад в. Чачэвічы да вусця (94 *км*); лесасплаўная. У ніжнім цячэнні каля в. Чыгірынка Чыгірынская ГЭС і *Чыгірынскае вадасховішча*. На Друці г. Талачын, г. п. Круглае, Бялынічы, г. Рагачоў (пры ўпадзенні ў Дняпро).



Друя. Агульны выгляд.

ДРУЦЭ Іон Панцеляймонавіч [н. 3.9.1928, в. Харадыштэ Сароцкага пав. (Бесарабія)], малдаўскі савецкі пісьменнік. Скончыў Вышэйшыя літ. курсы пры СП СССР (1957). Друкуецца з 1951. Аўтар аповесцей «Лісце суму» (1955), «Апошні месяц восені» (1963, аднайменны кінафільм 1966), рамана «Цяжар нашай дабраты» (1963—68), п'ес «Каса марэ» (1960), «Дойна» (1971). Дзярж. прэмія Малд. ССР 1967. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Малдаўскія апавяданні, Мн., 1958; у час.— «Полымя», 1959, № 12; там жа, 1967, № 11; «Вожык», 1968, № 9; рус. пер.— Листья грусти. Повесть и рассказы, М., 1965; Каса маре, Кишинев, 1965; Бремя нашей доброты, М., 1969.

Літ.: Адамович А. Прекрасное бремя человечности, «Неман», 1968, № 9.

ДРУЯ (Сапежын), гар. пасёлак (з 1940) у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., пры ўпадзенні Друйкі ў Зах. Дзвіну. Канцавая чыг. ст. на лініі Варапаева — Друя. За 30 *км* на ПнУ ад Браслава, 205 *км* ад Віцебска. 2,5 тыс. ж. (1971).

Вядомы з 15 ст. Належаў кн. Сапегам. У 1515 спалены рус. войскамі. У 16 ст. недалёка ад упадзення р. Друйкі ў Зах. Дзвіну пабудаваны манастыр бернардзінцаў (асталіся разбураны будынак і сцяна). З 1795 у складзе Рас. імперыі, заштатны горад Віленскай губ. З(15).6.1812 каля Д. адбылася бітва паміж рус. і франц. войскамі. У 1897 у Д. 4787 ж. У бурж. Польшчы (1921—39) у Браслаўскім пав. Віленскага ваяводства. З чэрв. 1941 да ліп. 1944 акупаваны ням.-фаш. захопнікамі.

Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, 2 дзіцячыя сады, сельскае прафес.-тэхн. вуч. механізацыі меліярацыйных работ, Дом культуры, б-ка, бальніца, лёгачна-туберкулёзны санаторый «Друя». Помнік генералу Я. П. Кульнёву. Брацкая магіла 146 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні Д. ад ням.-фаш. захопнікаў.

ДРЫБІН (да 1959 раённы цэнтр), вёска ў Горацкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Про-

ня. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дрыбінскі». За 22 *км* на ПдУ ад Горак, 70 *км* ад Магілёва, на скрыжаванні аўтамаб. дарог, якія злучаюць вёску з Магілёвам, Горкамі, з вёскамі Цёмны Лес і Расна. 1817 ж., гасп. 531 (1971). Масласырзавод, камбінат камунальных прадпр., камбінат быт. абслугоўвання, пякарня, каўбасны цэх, цэх безалкагольных напіткаў. Сярэдняя школа, школа-інтэрнат, Дом культуры, 2 б-кі, 2 дзіцячыя сады, бальніца, аптэка, 12 магазінаў. Ням.-фаш. карнікі ў 1941 спалілі вёску, расстралялі 435 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў, помнік 704 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДРЫВЯТЫ, возера ў бас. р. Друйкі (бас. Зах. Дзвіны), у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. 130 *м* над узр. м. Пл. 36,1 *км*². Даўж. 9,8 *км*, найб. шыр. 4,8 *км*, сярэдняя 3,7 *км*, найб. глыб. 12 *м*, сярэдняя 6,1 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы асіметрычныя: паўночныя высокія (да 37 *м*), паўднёвыя нізкія (5—10 *м*), забалочаныя; пераважна ворныя. Даўж. берагавой лініі 37,6 *км*. Зах. ч. возера амаль авальнай формы з малапрэзанымі берагамі; ва ўсх.— залівы і бухты. Прафундаль азёрнай чашы ўслана краменяземістымі сапрапелямі, высокаарганічныя адклады толькі ў моцна заросшых заліва х. На возеры 4 а-вы. На ўзровень, памеры возера, колькасць а-воў значна ўплывала гаспадарчая дзейнасць чалавека — паглыбленне ложа, будаўніцтва плацін на Друйцы. У 1926 пры ўзроўні 132 *м* пл. возера 38,2 *км*², 3 а-вы; у 1958 узровень 129 *м*, пл. возера 32,6 *км*², 11 а-воў. Ледастаў з канца ліст.— пач. снеж. да канца сак., часам да сярэдзіны крас.— пач. мая. Ваганні ўзроўню вады за год не перавышаюць 100 *см*. Сярэднемесячная т-ра вады па паверхні ў чэрв. 17,2, ліп. 18,8, жн. 17,8 °С. У бязлёдны перыяд вецер перамешвае ваду да дна, добра насычае яе кіслародам. Мінералізацыя менш за 200 *мг/л*, клас гідракарбанатна-кальцыевы. Вадазбор (456 *км*²) пераважна сярэднеўзгорысты, на Пд часткова плоска-хвалісты і дробнаўзгорысты. Возера эўтрофнага тыпу. Надводная расліннасць займае каля 6% пл. возера, падводная амаль 12%. Найб. пашыраны трыснёг, чарот, хвошч багнавы, драсён земнаводны, шышняк, рдзесты, эладэя, хараўыя водарасці. Трапляюцца рэдкія для Беларусі макрафіты: наяда гнуткая, наяда малая, гідрыла кальчаковая. Возера праточнае: у яго ўпадаюць рэчкі Усвіца, Акупёўка, Рака і Золвіца; выцякае Друйка. Водзіцца каля 20 відаў рыб: плотка, лешч, шчупак, судак, лінь, мянтуз, акунь, язь, верхаводка і інш.; ёсць вугор. Улоў рыбы 20—30 *кг* з 1 *га* за год (перапрацоўваецца на рыбзаводзе). На паўн. беразе г. *Браслаў*, турбаза, на паўд.-ўсх.— парк *Бяльмонт*. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Віцебская вобласць*.

Літ.: Биологическая продуктивность эвтрофного озера [Дрывяты], М., 1970 (Труды Всесоюзного гидробиологического об-ва, т. 15); Воровик Е. А. Рыбопромысловые озера Белоруссии, Мн., 1970.

П. І. Бурдыка. Мінск.

ДРЫГАВІЧЫ, адно з племянных аб'яднанняў усх. славян. Назва паходзіць, мабыць, ад слова «дрыгва». Паводле археал. даследаванняў Д. займалі тэр. на Пд ад Прыпяці, па У да Дняпра (Быхаў), на Пн да Барысава, Лагойска, Заслаўя. Зах. мяжа, на думку У. З. Завітневіча, В. В. Сядова і інш., праходзіла па Выганашчанскіх балотах (на Пн ад Пінска), па думку М. В. Доўнар-Запольскага, А. В. Успенскай, Я. І. Цімафеева,— па Зах. Бузе (гл. карту).

Папярэднікамі Д. у 6—8 ст. на сярэдняй Прыпяці былі слав. плямёны пражскай культуры, якія пакінулі паселішчы, курганныя і грунтавыя могільнікі. На Пн ад Прыпяці ў той час жылі балцкія плямёны. Найбольш стараж. археал. помнікі Д.— курганныя могільнікі з трупаспаленнем, пашыраны на Прыпяці, Бярэзіне, правабярэжжы Дняпра, у вярхоўях Случы і Арэсы, з канца 10 ст. могільнікі з трупапалажэннем. У пахаваннях побач з прыладамі працы, упрыгожаннямі, зброяй зрэдку трапляюцца драўляныя зрубы з двухсхільным дахам. Упершыню Д. ўпамінаюцца ў «Аповесці мінулых часоў» у падзеях, якія папярэднічаюць 9 ст. У 10 ст. (948) іх упамінае візантыйскі гісторык Канстанцін Багранародны, у 12 ст. (1149) стараж.-рус. летапісы. Д. належалі да найб. развітых у сацыяльных адносінах плямёнаў, знаходзіліся на заключнай стадыі распаду родаплемяннога ладу, мелі сваё палітычнае аб'яднанне «княжанне». Займаліся лядным земляробствам, жывёлагадоўляй, былі развіты промыслы і гандаль. Найб. гарады Тураў, Пінск, Давыд-Гарадок, Брэст, Клецк, Слуцк, Капыль, Рагачоў. У 10 ст. землі Д. увайшлі ў склад Кіеўскай Русі, пазней на іх тэр. ўзніклі *Турайскае княства*, паўн.-ўсх. частка трапіла ў *Полацкае княства*. Д. разам з *крывічамі* і *радзімічамі* пазней увайшлі ў склад бел. народнасці.

Літ.: Завитневич В. З. Формы погребального обряда в могильных курганах Минской губернии, «Труды IX Археологического съезда», т. 1, М., 1895; Довнар-Запольский М. В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII ст., Киев, 1891; Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья, М., 1970.

П. Ф. Лысенка. Мінск.



ДРЫГВА́, тое, што *багна*.

ДРЫГУЧЫ, вёска ў Уэмёнскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл., на беразе Зах. Дзвіны. Цэнтр калгаса імя Кутузава. За 25 *км* на ПнУ ад Міёраў, 183 *км* ад Віцебска, 27 *км* ад чыг. ст. Міёры. 68 ж., гасп. 20 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ДРЫЖНІК (Briza), род адна- і шматгадовых рыхлакустовых траў сям. злакавых. Вядома больш за 20 відаў, пашыраных у Еўропе, Паўн. Афрыцы, Паўн. Амерыцы. У СССР 7 відаў, на Беларусі адзін — Д. сярэдні (B. media; нар. назвы: мятлічка, палявыя канапелькі, слёзкі, муткі, клапкі).

Расліна з пекалькімі сцяблами, выш. да 80 *см*, утварае невял. кушчні. Лісце плоскае, вузкае. Суквецце — мяцёлка. Расце на лугах. Добра паядаецца жывёлай.



Дрыжнік сярэдні.

ДРЫЖЫ́НЬ, унутраная частка сялянскага двара пры кругавым, т. зв. замчыстым размяшчэнні гаспадарчых пабудоў. Гл. *Сядзіба*.

ДРЫЗГАЛО́ВІЧ Іларыён Мікітавіч (1883, в. Жабін Слуцкага пав.— жн. 1919), удзельнік трох рэвалюцый і грамадзянскай вайны. З сялян. Чл. КПСС з 1917. З 1898 працаваў на з-дах Кіева і Пецярбурга. У рэвалюцыю 1905—07 змагаўся на барыкадах у Пецярбургу. Удзельнічаў у штурме Зімняга палаца. ў Петраградзе. З канца 1917 вёў агіт.-арганізацыйную работу на стварэнні атрадаў Чырв. Арміі. З вясны 1919 на сав. рабоце на Беларусі. У час акупацыі Беларусі бурж. Польшчай у тыле ворага, арганізатар і кіраўнік партыз. атрадаў і груп. У жн. 1919 арыштаваны і расстраляны акупантамі. У краязнаўчым музеі в. Чапялі Салігорскага р-на стэнд пра Д.

ДРЫЛЬ (ад ням. drillen свідраваць), пераносны інструмент, якім свідруюць і апрацоўваюць адтуліны ў метале, дрэве і інш.

Бываюць электрычныя, пнеўматычныя (ратацыйныя, з пнеўматычным лопасцевым рухавіком) і ручныя. Электрадрыль складаецца з эл. рухавіка, зубчастай перадачы і патрона для свердла. Скорасць вярчэння свердла 150—2200 *аб/мін*. Ужываецца для свідравання і апрацоўкі невялікіх (да 50 *мм*) адтулін.

ДРЫНАЎ Марын Сцяпанавіч [20.10.1838, Панагюрыштэ — 28.2(13.3).1906], балгарскі і рускі славіст. Скончыў Маскоўскі ун-т (1865). Адзін з арганізатараў (1869) Балгарскага літ. т-ва («Българска книжовно дружество», з 1911 Балгарская АН). У 1873—1906 праф. Харкаўскага ун-та (за выключэннем 1878—79, калі быў міністрам асветы Балгарыі). З 1898 чл. Пецярбургскай АН. Аўтар многіх прац па гісторыі паўд.-слав. народаў, крыніцазнаўстве, этнаграфіі, моваznаўстве, літаратуразнаўстве.

Тв.: Съчинения, т. 1—3, София, 1909—15; Заселение Балканского полуострова славянами, [М., 1873]; Южные славяне и Византия в X в., М., 1876.

Літ.: Никитин С. А., М. С. Дринов как историк, «Краткие сообщения Ин-та славяноведения АН СССР», 1957, [в.] 21; Карский Е., М. С. Дринов. [Некралог], «Русский филологический вестник», 1906, т. 55, № 1 и 2.

ДРЫНЬ Савелій Рыгоравіч [22.12.1911(4.1.1912), в. Таўбозіна Мглінскага пав. Чарнігаўскай губ.— 25.6.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з вер. 1943. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 25.6.1944 у баі за нас. пункт Святое Возера Рагачоўскага р-на з вязкай гранат кінуўся пад варожы танк. Пахаваны ў Рагачове.

ДРЫСА, рака, правы прыток Зах. Дзвіны. Даўж. 183 *км*. Пачынаецца з воз. Дрысы, цячэ ў Расонскім р-не праз азёры Астроўцы, Данское, Сіньша, Пралобна, Буза і ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл. Вадазбор (6420 *км*²) у межах Полацкай нізіны. Рэльеф пераважна хвалісты, толькі ў верхняй ч. дробна- і сярэднеўзгорысты, канцовамарэнны. Азёрнасць вадазбору 5%, балоты і забалочаныя землі займаюць 35, лясы 30%. Шыр. далiны 200—500 *м*. Схілы спадзістыя і ўмерана стромкія, выш. 4—9 *м*, у нізоўі да 20 *м*. Шыр. ракі пераважна 20—40 *м*. Асн. прытокі: Нішча, Свольна (справа), Дахнарка (злева). Ледастаў з канца снеж. да канца сак.— пач. красавіка. Жыўленне мяшанае: снегавое, дажджавое, грунтавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 45,6 *м*³/*сек*. На Д. ў вусці г. Верхнядзвінск.

Н. Дз. Шэка. Мінск.

ДРЫСА, ранейшая (да 1962) назва горада *Верхнядзвінска*.

ДРЫСВЯ́ТА, рака, левы прыток Дзісны. Даўж. 44 *км*. Цячэ праз азёры Доўгае, Высокае, Богінскае ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Вадазбор (1020 *км*²) у верхняй ч. на Браслаўскай градзе, у ніжняй на Дзісенскай нізіне. Жыўленне мяшанае: снегавое, дажджавое, грунтавое. Сярэдні гадавы расход вады каля вусця 6,1 *м*³/*сек*. У верхнім цячэнні, каля воз. Дрысвяты, ГЭС *«Дружба народаў»*, у сярэднім — ГЭС «Шлях да камунізма».

ДРЫСВЯТЫ (літ. Drūkšiai), возера ў бас. р. Дзісны, левага прытока Зах. Дзвіны, на мяжы Літ. ССР і БССР (Браслаўскі р-н Віцебскай вобл.). 141 *м* над узр. м. Пл. 44,5 *км*² (у межах БССР каля 10 *км*²). Даўж. 13 *км*, найб. шыр. 5,8 *км*, сярэдняя 3,4 *км*, найб. глыб. 31 *м*, сярэдняя 7 *м*. Катлавіна выгнутай формы, выцягнутая на З і Пд. Схілы — узгоркі і грады, якія акаймоўваюць возера, выш. да 15 *м*; у асобных мясцінах спадзістыя і непрыкметна зліваюцца з балотамі, усх. і паўд.-ўсходнія пад ворывам, астатнія аблесеныя. Берагавая лінія (даўж. 60,5 *км*) моцна парэзаная залівамі, асабліва ў паўд. частцы. У месцы зліцця берагоў са схіламі катлавіны ўздоўж урэзу вады многа валуноў. На воз. 8 а-воў, найбольшы Замак (пл. 0,26 *км*²). Рэльеф дна значна ўзгорысты. Цэнтр. частка дна возера ўкрыта алiўкавым, шэрым і карычневым ілам; пясчаныя і пясчана-галечныя грунты пераважна на глыб. да 5 *м*. Ледастаў з пач. снеж. да пач. мая. Сярэднемесячная т-ра вады на паверхні 11,9 °С (май), 17,5 (чэрв.), 19,7 (ліп.), 18,3 (жн.), 14,1 °С (вер.).

Водная маса багатая кіслародам. Мінералізацыя вады 180—230 *мг/л*. Вадазбор (604 *км²*) узгорыста-градавы; у паніжэннях паміж пясчанымі ўзгоркамі і градамі балоты і невялікія азёры. Каля 30% тэр. пад лесам і хмызняком, 13% пад балотамі і забалочанымі землямі, каля ½ плошчы пад ворывам. На тэр. вадазбору 107 азёраў. Самыя вялікія: Рычы, Апівардa, Пруці (Прутас), Смалвас. Сцёк з азёраў паўд.-зах. часткі вадазбору ў Д. пераважна праз р. Апівардку і ручай Смалвянка; з паўн.-усходняй — праз р. Рычанку. З Д. на ПдУ выцякае р. Прорва, якая цячэ праз воз. Ставок. Д. эўтрофнага тыпу; каля 10% пл. зарастае трыснягом, чаротам, сітнікам, дзеразою. Водзяцца плотка, шчупак, лешч, акунь, верхаводка, язь, лінь, мянтуз, рапушка, судак, сазан; ёсць вугор. Улоў рыбы 20—25 *кг* з 1 *га* за год. Возера Д.— вадасховішча ГЭС *«Дружба народаў»*. *К. К. Крыловіч.* Мінск.

ДРЫСВЯТЫ, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., каля воз. Дрысвяты. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Авангард». Аўтобусны прыпынак на шашы Відзы — Даўгаўпілс. За 28 *км* па З ад Браслава, 266 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Турмантас (Літ. ССР). 275 ж., гасп. 99 (1971). ГЭС *«Дружба народаў»*, майстэрня для рамонту с.-г. тэхнікі. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аптэка, адд. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Паводле звестак бурж. гісторыка О. Гедэмана, у Д. в. 15—16 ст. існаваў замак.

Літ.: Hedemann O. Historja powiatu Brasławskiego, Wilno, 1930, s. 381—387.

ДРЫСЕНСКІ ЛАГЕР, умацаванні рускіх войск, пабудаваныя ў лукавіне Зах. Дзвіны на ПнЗ ад Дрысы (Верхнядзвінска) напярэдадні Айч. вайны 1812.

Меркавалася, што ў выпадку нападу напалеонаўскай арміі 1-я рус. армія Барклая дэ Толі адыдзе ў Д. л. і затрымае наступленне гал. франц. сіл. Тым часам 2-я рус. армія Багратыёна нанясе ўдары па флангах праціўніка. На пачатку вайны 1-я рус. армія, адступаючы ад Вільні цераз Свянцяны, прыбыла 26 чэрв. ў Д. л. Але лагер не прыкрываў шляхоў да Масквы і Пецярбурга, быў цесны ((*км*) 4,3×3,2) для размяшчэння і баявых дзеянняў войск, меў адкрытыя подступы, слабыя ўмацаванні (3 лініі рэдутаў), існавала магчымасць абысці лагер з флангаў. Рус. арміі, раздзеленыя адлегласцю ў 200 *км*, маглі быць разбіты Напалеонам паасобку. Таму Барклай дэ Толі, пакінуўшы ў Д. л. корпус ген. Вітгенштайна, 2 ліп. накіраваў армію праз Віцебск на маскоўскую дарогу, каб злучыцца з 2-й арміяй, якая адыходзіла з Ваўкавыска на Смаленск. Затрымка ў Д. л. 1-й рус. арміі ўскладніла ход баявых дзеянняў аж да часу злучэння абедзвюх рус. армій каля Смаленска.

Літ.: Гл. пры арт. *Айчынная вайна 1812.*

ДРЫСЫ, возера, выток р. Дрыса (бас. Зах. Дзвіны), у Расонскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 2,42 *км²*. Даўж. 3,7 *км*, найб. шыр. 0,9 *км*, сярэдняя 0,6 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Вадазбор (52,9 *км²*) слабаўзгорысты. Д. злучана пратокаю з воз. Глыба. Водзяцца плотка, акунь, джгір, лешч, лінь, шчупак.

ДРЫЧЫН, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл., на правым беразе р. Пціч. Цэнтр сельсавета. За 33 *км* на ПдЗ ад Асіповіч, 166 *км* ад Магілёва, 12 *км* ад чыг. ст. Фалічы, на аўтамаб. дарозе г. Асіповічы — в. Шышчыцы. 338 ж., двароў 116 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, сепаратарны пункт. Пач. школа, адда. сувязі, вет. пункт, магазін.

ДРЫЧЫН, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дрычынскі». За 15 *км* на ПнЗ ад Мар'інай Горкі (адм. ц. раёна), 48 *км* ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Дрычын. 496 ж., гасп. 147 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, адда. сувязі, сталовая, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Помнікі на 2 брацкіх магілах сав. воінаў і партызанаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДРЫЯСАВЫЯ СЛАІ (*дрыяс*), адклады заключнай халоднай фазы *валдайскага аледзянення*. Вылучаюць ніжнія (старажытныя), сярэднія і верхнія (позднія) Д. с., якія раздзяляюцца адкладамі больш цёплых адрэзкаў часу (адпаведна бёлінга і алерода). Часу пашырэння Д. с. на тэр. БССР характэрны сухі халодны клімат і бедная тундра-лесастэпавая расліннасць — дрыяда, палын, эфедра, лебяда, палярная вярба, карлікавая бяроза, эрэдку хвоя і інш. У азёрах, рэках і на схілах узвышшаў на Беларусі пашыраліся пяскі, супескі, гліны. Звычайна лічаць, што пасля позняга дрыясу пачаўся *галацэн*.

ДРЭВА, шматгадовая расліна з добра выражаным асноўным адраўнелым сцяблом — ствалом, які нясе крону, і з разгалінаванай каранёвай сістэмай. Як жыццёвая форма ўзнікла ў працэсе эвалюцыі раслін у сярэднім дэвоне.

У хвойных Д. (хвоя, елка, піхта) і ў большасці лісцевых з класа двухдольных (дуб, граб, бяроза, асіна) крона складаецца з галін і лісця. Ствол і галіны маюць другасны прырост у таўшчыню, у выніку кожны год утвараюцца гадавыя кольцы прыросту. У большасці Д. з класа аднадольных (пальмы) крона складаецца толькі з разеткі вялікага лісця, другаснага прыросту ствалоў у таўшчыню няма. Летнезялёныя Д. з надыходам восені скідваюць лісце, у вечназялёных абнаўленне ідзе паступова за некалькі гадоў. Лісцевыя Д. сярэдніх шырот падзяляюцца на шыракалістыя (дуб, ясень, ліпа) і драбналістыя (бяроза, асіна, вольха). Працягласць жыцця і рост Д. у вышыню залежаць ад кліматычных і глебавых умоў і бівл. асаблівасцей віду. Некат. віды жывуць 4—5 тыс. гадоў (баабаб, секвоя) і растуць у вышыню да 140—155 *м* (аўстралійскія эўкалінты, каліфарнійскія секвоі). Мяжа ўзросту дуба да 1500—2000 гадоў, хвоі, лістоўніцы 550—600, бярозы, асіны, вольхі чорнай 150—200 гадоў. Дуб, ясень, хвоя, елка даслягаюць вышыні 35—50 *м*, асіна, бяроза, вольха чорная 25—35, рабіна, груша 15—20 *м*.

У СССР каля 600, на Беларусі каля 30 дзікарослых відаў Д., з іх найб. важныя лесаўтваральныя пароды: хвоя, елка, дуб звычайны, ясень, ліпа, клён, граб, бярозы бародаўчатая і пушыстая, асіна, вольхі чорная і шэрая. Д. даюць ядомыя плады, лекавую, тэхн. і хім. сыравіну, выкарыстоўваюцца на азеляненне і полеахоўныя насадкі. Дрэўныя расліны — адзін з асн. прадуцэнтаў кіслароду паветра; лясныя масівы маюць вялікае вода-, глебаахоўнае, эстэт. і інш. значэнне.

Літ.: Деревья и кустарники СССР, т. 1—7, М.—Л., 1949—65; Серебряков И. Г. Экологическая морфология растений, М., 1962; Гроздов В. В. Дендрология, 2 изд., М.— Л., 1960; Флора БССР, т. 1—5, М.— Мн., 1949—59. *В. С. Гельтман.* Мінск.

ДРЭВААПРАЦОЎЧАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, галіна прамысловасці па механічнай і хімічна-механічнай апрацоўцы драўніны. Асн. вырабы: аконныя пераплёты, дзверы, дошкі, паркет, гонты, струганыя матэрыялы, тынкавальная дранка, клееная фанера, струганы і лушчаны шпон, гнуткаклееныя дэталі, драўнінныя пліты (стружкавыя і валакністыя), мэбля, дэталі для вагона-, судна- і аўтамабілебудавання, запалкі, спарт. інвентар і інш.

Удзельная вага Беларусі ў агульным аб'ёме дрэваапрацоўчай вытворчасці Расіі ў 1913 складала 6,5%, па колькасці рабочых 8%. Пераважала лесапіляванне (59,1% усёй валавой прадукцыі Д. п. Беларусі, 26,8% пілаваных матэрыялаў у агульнарасійскай вытворчасці). Лясная сыравіна і паўфабрыкаты іншай перапрацоўкі за мяжу. Найбольшыя прадпрыемствы Д. п. дарэвалюц. Беларусі: Бабруйскі і Гомельскі лесапільныя з-ды, запалкавыя і фанерныя прадпрыемствы «Прагрэс-Вулкан» у Мінску, «Віктарыя» і «Вярэніна» ў Барысаве, «Везувій» у Гомелі, лесапільны з-д у Мазыры і інш. У 20—30-я г. на тэр. БССР пачалі працаваць запалкавая ф-ка «Дняпро» у Рэчыцы, дрэваапрацоўчы з-д у Мінску, Гомельскі лесакамбінат (на базе лесапільных з-даў), Бабруйскі лесакамбінат, запалкавая ф-ка «Пралетарская перамога» і фанерны з-д (апошні на базе запалкавай ф-кі «Чырвоная Вярэніна») у Барысаве, *Бабруйскі фанера-дрэваапрацоўчы камбінат, Гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат*, Віцебскі фанерны з-д і інш. прадпрыемствы. Да Айч. вайны ў БССР было 3 дрэваапрацоўчыя камбінаты, 26 леса-, 16 фанерных з-даў, 4 запалкавыя і 5 мэблевых ф-к. У 1940 аб'ём выпуску прадукцыі Д. п. Беларусі больш чым у 6,5 раза перавысіў узровень 1913 (гл. табл.). Выпуск клеенай фанеры складаў 34,8%, запалак 28,6% агульнасаюзнай вытворчасці гэтай галіны. У Айч. вайну ўсе прадпрыемствы Д. п. разбураны. Пасля Айч. вайны побач з адноўленымі пабудаваны новыя прадпрыемствы Д. п. Для больш поўнага выкарыстання драўніны шырока ўжываюцца хіміка-механічныя метады яе апрацоўкі. Найбольш буйныя прадпрыемствы Д. п. БССР (1971): Бабруйскі і Мастоўскі фанера-дрэваапрацоўчыя камбінаты, Гомельскі, Мазырскі, Рэчыцкі, Барысаўскі дрэваапрацоўчыя, Пінскі і Гомельскі фанера-запалкавыя камбінаты, *Барысаўскі фанера-запалкавы камбінат*, 21 мэблевая ф-ка (у Бабруйску, Віцебску, Маладзечне, Мінску, Слоніме і інш.). Усяго на пач. 1971 было 40 прадпрыемстваў, якія ўваходзілі ў склад 12 вытворчых аб'яднанняў гэтай галіны. Прадукцыя ідзе таксама ў інш. рэспублікі СССР і на экспарт.

Найбольшыя прадпрыемствы Д. п. СССР размешчаны ў рабонах лесанарыхтовак, а таксама ў пунктах прыплаву сыравіны (Архангельск, Тауда Свярдлоўскай вобл., лесазаводы ў Карэліі, дрэваапрацоўчыя з-ды ў Ленінградзе, Краснаярску). Найбуйнейшыя дрэваапрацоўчыя комплексы Брацкі, Асінаўскі, камбінаты — Кіеўскі, Днепрапятроўскі і інш. З інш. сацыяліст. краін найбольш развіта Д. п. у Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Румыніі, Балгарыі, з капіталіст.— у ЗША, Швецыі, Канадзе, Фінляндыі, Францыі.

Літ.: Любомиров П. Г. Очерки по истории русской промышленности. XVII, XVIII и начало XIX в., Л.— М., 1947; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967, Мн., 1967; Самуйленка Ф. А. Лясная, папяровая і дрэваапрацоўчая прамысловасць Беларусі, Мн., 1957; Хитровающей промышленности Белоруссии за годы Советской власти. «Деревообрабатывающая промышленность», 1967, № 11. *А. Л. Кійко.* Мінск.

ДРЭВААПРАЦОЎЧЫЯ СТАНКІ, прызначаны для вырабу з натуральнай драўніны і штучных драўнінных матэрыялаў розных дэталяў, паўфабрыкатаў і гатовых вырабаў (брусоў, дошак, фанеры, дэталяў с.-г. машын, мэблі, тары і інш.). Д. с. падзяляюцца на рэзальныя, гнутарныя, клеяльна-зборачныя, аддзелачныя і прэсы. Асноўныя з іх рэзальныя.

Рэзальныя станкі паводле спосабу рэзання падзяляюцца на: пілавыя (*лесапільныя рамы*, кругла-, стужкапільныя), якія распілоўваюць драўніну на часткі (загатоўкі); фрэзеравальныя (рэйсмусавыя, *фугавальныя станкі*, чатырохбаковыя стругальныя, фрэзерныя, *шыпарэзныя станкі*), прызначаныя для чыставой апрацоўкі плоскіх і фасонных паверхняў вырабаў; стругальныя (папярочна-падоўжна-стругальныя, цыклявальныя), у якіх апрацоўцы драўніны равец ці дэталь рухаюцца адноўжна-паступальна; свідравальныя (адна- і многашпіндзельныя, свідравальна-пазавальныя, свідравальна-даўбёжныя), на якіх робяць адтулін і пазы; токарныя, на якіх апрацоўваюць дэталі формаў вярчэннем; лушчыльныя, на якіх робяць шпону для фанеры, запалак і інш. зрэзаннем слоя драўніны з вярчальнай цуркі; шліфавальныя (стужкавыя, вальцовыя, дыскавыя), прызначаныя для канчатковай зачысткі паверхняў вырабаў. Ёсць таксама камбінаваныя станкі (маюць некалькі шпіндзеляў з рознымі інструментамі, якія напераменку пілуюць, свідруюць, фрэзеруюць), універсальныя (маюць адзін шпіндзель, на які насаджваецца той ці іншы рэзальны інструмент) і спецыялізаваныя, для апрацоўкі пэўнага віду вырабаў (аконных і дзвярных блокаў, лыжаў, запалак, паркету і інш.). На гнутарных станках выгінаюць драўніну (загатоўкі) пры вырабе лыжаў, дэталяў гнутай мэблі і інш. Да клеяльна-зборачных належаць *шчытазборачныя станкі* і інш., на якіх склейваюць дэталі пры зборцы вузлоў і вырабаў. На аддзелачных станках запаўняюць поры, фарбуюць, наносяць ахоўныя і дэкаратыўныя пакрыцці, паліруюць. На прэсах робяць шматслойную фанеру, драўнінастружкавыя пліты і інш. Скорасць рэзання на Д. с. да 100 *м/сек* і большая, скорасць падачы да 150 *м/мін* і большая, скорасць вярчэння інструмента да 30 000 *аб/мін*; таму пры рабоце на Д. с. вял. ўвагу аддаюць тэхніцы бяспекі. У дрэваапр. прамысловасці карыстаюцца таксама агрэгатнымі станкамі, станкамі-аўтаматамі і паўаўтаматамі, аўтам. і паўаўтам. станочнымі лініямі. Гл. таксама *Ахоранне драўніны, Даўбёжны станок, Лушчэнне, Цыклеванне, Дрэваапрацоўчая прамысловасць.*

Літ.: Манжос Ф. М. Деревообрабатывающие станки, М., 1963; Афанасьев П. С. Станки и инструменты деревообрабатывающих предприятий, М., 1968; Его же. Конструкции и расчеты деревообрабатывающего оборудования, М., 1970. *А. Р. Лахтанаў.* Мінск.

ДРЭВАРЫТ, даўнейшая назва гравюры на дрэве. Гл. *Гравюра.*

ДРЭВАСТОЙ, сукупнасць дрэў у раслінным угрупаванні (фітацэнозе).

Бывае чысты (з адной драўнай пароды) і мешаны (з некальких парод); просты (кроны дрэў утвараюць 1 ярус) і складаны (кроны утвараюць 2 і больш ярусаў). Фарміруецца ад дзеяння асяроддзя і уплывае на яго, вызначаючы

Выпуск найважнейшых відаў прадукцыі дрэваапрацоўчай прамысловасці ў БССР

Назва вырабаў	1913	1940	1950	1960	1965	1970
Піламатэрыялы, тыс. $м^3$	770	1635	2260	3023	2762	3070
Фанера клееная, тыс. $м^3$	35,5	253,9	92,0	169,7	194,1	212,7
Драўнінаваланкністыя пліты, тыс. $м^3$	—	—	1005	2004	2449	14750
Драўнінастружкавыя пліты, тыс. $м^3$	—	—	—	7,3	68,6	102,3
Мэбля, млн. руб.				54,4	89,8	136,5
Запалкі, тыс. скрынак	607	2865	1983,5	2788	2752	2991,2
Лыжы, тыс. пар	—	—	—	190,9	221,1	253,0

склад і развіццё іншай расліннасці фітацэнозу (кустоў, траў, імхоў).

Літ.: Морозов Г. Ф. Учение о лесе, 7 изд., М.—Л., 1949; Захаров В. К. Лесная таксация, 2 изд., М., 1967.

ДРЭДНОЎТ (англ. dreadnought бясстрашны), *браняносец*, пабудаваны ў Англіі ў 1905—06. Адзін з прататыпаў і агульная назва магутных *лінейных караблёў* перыяду 1-й сусв. вайны. Меў водазмяшчэнне 17 900 *т*, скорасць 21 вузел (38,9 *км/гадз*), узбраенне — дзесяць 305-*мм* і дваццаць чатыры 75-*мм* гарматы.

ДРЭЗДЭН (Dresden), горад у ГДР, адм. ц. акругі Дрэздэн. Размешчаны на берагах Эльбы. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог, аэрапорт, рачны порт. 506 тыс. ж. (1969). Неметалаёмкае машынабудаванне (электратэхніка, электроніка, дакладная механіка, оптыка, прыладабудаванне, вытворчасць рэнтгенаўскай, фота-, кіна- і радыёапаратуры), авіябудаванне. Хім. (фотахімія), паліграфічная, лёгкая (вытворчасць мэблі, адзення, вырабаў з керамікі, шкла і фарфору), тэкст. і харч. прамысловасць. Паблізу Д. (у Розендорфе) першы ў ГДР атамны рэактар. Тэхнічны ун-т. мед. акадэмія, ваен. акадэмія «Фрыдрых Энгельс» і інш. ВНУ. Тэатры, філармонія. Музеі. Заапарк.



Дрэздэн. Вароты «пад каронай» у ансамблі Цвінгер. 1711—22. Арх. М. Д. Пёпельман.

Гістар. ядро Д.— левабярэжны Стары горад з параўнальна правільнай сеткай вуліц і арх. помнікамі ўздоўж Эльбы: Замак (засн. каля 1200, перабудаваны ў 15—17 ст.), Палацавы ансамбль Цвінгер (1711—22, арх. М. Д. Пёпельман), ц. Гофкірхе (1738—56, арх. Г. К'яверы); двор Цвінгера замыкае карціннай галерэя (1847—49, арх. Г. Земпер; гл. *Дрэздэнская карціннай галерэя*). Правабярэжны Новы горад — з радыяльна-кальцавой планіроўкай; на беразе — Японскі палац (музей фарфору, 1715—41). Разбураныя амер. авіяцыяй 13.2.1945 раёны Д. зноў забудаваны і ўтвараюць арх. ансамблі.

Літ.: Wotte H., Göthel W. und Hoyer S. Dresden, Leipzig, 1968.

ДРЭЗДЭНСКАЯ КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ, адзін з найб. значных збораў еўрапейскага жывапісу. Створана ў 1722 з куншткамеры саксонскіх курфюрстаў, заснаванай у 1560. Значна папоўнілася ў 19—20 ст. 1240 карцін выратаваны ў 1945 Сав. Арміяй і пасля рэстаўрацыі вернуты ГДР. Д. к. г. зноў адкрыта ў 1956.

У аддзеле старых майстроў найб. шырока прадстаўлены мастакі Італіі: Адраджэння («Сіксцінская мадонна» Рафаэля, «Спячая Венера» Джарджоне, «Дышарый кесараў» Тыцыяна, творы А. Мантэні, С. Батычэлі, Караджа, П. Веранезе, Я. Тынтарэта) і Нідэрландаў 15—17 ст. («Аўтапартрэт з Саскіяй на каленях» Рэмбранта, «Вірсавія» П. П. Рубенса, карціны Я. ван Эйка, Я. Вермера). Там жа знаходзяцца ўзоры старога нямецкага жывапісу (А. Дзюрэр, Л. Кранах, Г. Гольбейн). У аддзеле новых майстроў творы нямецкіх мастакоў 19—20 ст.

Літ.: Алпатов М. В. и Данилова И. Е. Старые мастера в Дрезденской галерее, М., 1959; Зейдевитц Р. и Зейдевитц М. Дрезденская галерея, пер. с нем., М., 1965.

ДРЭЙЗІН Юльян Мікалаевіч [10(22).6.1879, Екацярынаслаў — 28.3.1942], беларускі савецкі музыказнавец, публіцыст, перакладчык. Скончыў Маск. ун-т (1908). Выкладаў грэч. і лац. мовы ў гімназіі (да 1918) і гісторыю ў школах Магілёва. У 1925—35 працаваў у Мінску выкладчыкам гісторыі і тэорыі музыкі ў муз. тэхнікуме і кансерваторыі, грэч. і лац. моў у Камуніст. ун-це БССР, БДУ, АН БССР. Аўтар артыкулаў пра актуальныя пытанні развіцця нац. муз. мастацтва, асвятляў муз. жыццё Мінска. Перакладаў на бел. мову лібрэта класічных опер, творы ант. аўтараў, у т. л. «Антыгону» Сафокла (выд. 1926). З 1935 выкладчык Маск. дзярж. ун-та і інш. ВНУ Масквы.

Тв.: Музыка ў творах беларускіх паэтаў, «Полымя», 1925, № 6; Кастрычнік і музыка, там жа, 1927, № 7; Кастрычнік і беларуская музыка, «Узвышша», 1927, № 5; Праблемы нацыянальнай музыкі, «Маладняк», 1926, № 11. *Т. А. Дубкова.* Мінск.

ДРЭЙФ ЛЬДОЎ у моры, рух плывучых ільдоў пад дзеяннем вятроў і цячэнняў.

Скорасць ветравога Д. л. ў 50 разоў меншая за скорасць ветру. Ад дзеяння сілы вярчэння Зямлі адбываецца адхіленне Д. л. ад кірунку ветру ў сярэднім калля 30° управа ў арктычных і ўлева ў антарктычных шыротах. Пад дзеяннем ветру лёд захоплівае прылеглы слой вады. На характар Д. л. уплываюць берагі, астравы, водмелі. Дрэйфуюць таксама і *айсбергі*, якія рухаюцца больш павольна, чым ледзяныя палі, і часта адхіляюцца ад асн. кірунку цячэння. Магутныя халодныя цячэнні (Лабрадорскае, Перуанскае) выносяць палярныя льды ва ўмераныя і нават субтрапічныя шыроты. Д. л. часта сур'ёзна перашкаджаюць суднам.


ДРЭНАЖ (франц. drainage ад англ. drain асушаць), 1) у тэхніцы — сістэма водаадводных хадоў, трубаў, зробленая ў групе ці ў аснове збудавання для асушэння глебы, паніжэння ўзроўню грунтавых водаў, адводу іх ад збудавання.

Д. ужываецца для павышэння ўрадлівасці забалочаных зямель, аздараўлення мясцовасці, асушэння і ўмацавання асноў збудаванняў, дарог, аэрадромаў, для паніжэння ціску вады на збудаванне, памяшканні зоны насычанасці водою масіву. Вада, якая паступае ў дрэнажную сістэму, адводзіцца ў раку, возера. На вельмі вільготных участках дрэнажная сістэма складаецца з усмоктвальных дрэнаў, калектараў, водаадводных каналаў і водапрыёмніка. Дрэнажныя керамічныя трубкі вырабляе Віцебскі керамзітавы з-д. Гл. таксама *Дрэнажныя машыны*.

2) Д. у медыцыне — гумавыя ці шкляныя трубкі, палоскі гіграскапічнай марлі, з дапамогай якіх выводзіцца вадкае змесціва з раны, гнайнікоў, поласцей цела.


ДРЭНАЖНЫЯ МАШЫНЫ, машыны і механізмы для пракладкі і рамонту *дрэнажу*. Паводле прызначэння падзяляюцца на траншэекапальнікі, трубаўкладчыкі; кротадрэнажныя, дрэнажнашчылінныя і дрэнапрамыўныя машыны.

Траншэекапальнікі (робяць траншэі глыб. да 3,5 *м*, шыр. ад 0,1 да 0,8 *м*) падзяляюцца: паводле канструкцыі рабочага органа на адналапатовыя, шматкаўшовыя (ланцуговыя або ротарныя), шнекавыя і плужныя; паводле агрэгатавання на самаходныя, навясныя і прычапныя; паводле хадавой часткі на гусенічныя і колавыя. Трубаўкладчыкі



Кротадрэнажная машына (Д-657).

бываюць трох тыпаў: укладчыкі керамічных трубаў, укладчыкі гатовых пластмасавых трубаў і фармоўшчыкі трубаў са стужкі з адначасовай іх укладкай. У іх два рабочыя органы: землярыйны і трубаўкладачны. Укладчыкі керамічных трубаў бываюць з ручною ці аўтам. загрузкаю, свабоднаю ці прымусоваю падачаю і ўшчыльненнем стыкаў пад дзеяннем сілы цяжару. Для ўкладкі гатовых пластмасавых трубаў прызначаны нажавыя і ланцуговыя скрабалкавыя машыны. З іх дапамогаю трубы ўкладваюцца на дно траншэі праз накіраваны жолаб ці працягваннем трубы ў кротавую дрэну. Машыны для фармавання трубаў са стужкі з адначасовай іх укладкай маюць трубафармавальны апарат, які даваляе экспрэсным метадам фарма-



Агрэгат для прамыўкі дрэнажных сістэм.

ваць трубы дыяметрам 25—150 *мм* са стужак віпласту, поліпрапілену, поліэтылену і інш. матэрыялаў. Кротадрэнажныя машыны маюць нож-дрэнар, бываюць навясныя і прычапныя, пракладваюць кротавыя дрэны дыяметрам 200—250 *мм* у тарфяных грунтах і 80—100 *мм* у мінер. грунтах. Дрэнажнашчылінныя машыны бываюць дыскавыя, баравыя і вінтавыя. Утвараюць шчыліну глыб. да 2,5 *м*. Дрэнапрамыўныя ачышчаюць дрэнажныя сістэмы; у дрэнажныя вайленыя трубы вада падаецца пад ціскам да 100 *ат*. Маскоўскі э-д меліярацыйных машын вырабляе кратавальнік навясны КН-1200, кротадрэнажную машыну Д-657 і інш.

Літ.: Рябов Г. А., Мер И. И. и Прудников Г. Т. Мелиоративные и строительные машины, М., 1968; Казаков В. С. и Томин Е. Д. Механизация строительства закрытого дренажа на осушаемых и орошаемых землях, М., 1969.

І. І. Леановіч. Мінск.

ДРЭСІРОЎКА (ад франц. dresser), навучанне жывёл шляхам шматразовага паўтору практыкаванняў, каб выпрацаваць і замацаваць пэўныя звычкі. Д. называюць і публічны паказ абучаных жывёл.

Як відовішча Д. вядома з стараж. часоў (у Эгіпце, Грэцыі, Рыме, Візантыі, Кітаі). У сярэднія вякі з дрэсіраванымі жывёламі выступалі вандроўныя камедыянты — гістрыёны, жанглёры, буфоны; на Русі — скамарохі. На Беларусі ў 17 ст. існаваў пар. промысел лавіць і дрэсіраваць мядзведзяў (гл. *Смаргонская акадэмія*). Да 90-х г. дрэсіравалі пераважна групы аднародных жывёл, пазней і мяшаныя (у Расіі першыя дрэсіроўшчыкі *Дуровы*). Метады Д.: «дзікая», болевая; мяккая, гуманная; комплексная. Мяккую Д. ўвёў нямецкі дрэсіроўшчык К. Гагенбек у канцы 19 ст., у Расіі яе прапагандаваў У. Л. Дураў.

Літ.: Гл. пры арт. *Цырк*.

ДРЭТУНЬ, чыг. ст. на лініі Полацк — Невель (РСФСР); вёска ў Маласітнянскім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл., каля р. Палата (3 *км*). За 36 *км* на ПнУ ад Полацка, 136 *км* ад Віцебска, на скрыжаванні аўтамаб. дарог на Полацк, в. Янкавічы, в. Труды. 660 ж., гасп. 269 (1971). Лясгас, 2 лясніцтвы. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 4 магазіны. Помнік на брацкай магіле 348 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДРЭЧЫН Сымён Вульфавіч (Уладзіміравіч) [н. 11(24).12.1914, Мінск], беларускі савецкі артыст балета і балетмайстар. Нар. арт. БССР (1954). Скончыў Бел. студыю оперы і балета (1933). У 1933—41 і 1944—59 саліст, у 1950—59 таксама балетмайстар Бел. т-ра оперы і балета (у 1942—44 у Вял. т-ры СССР). У 1959—64 балетмайстар т-раў оперы і балета ў Уфе, Львове, Кішынёве, Саратаве. Стварыў вобразы Сымона (першы бел. балет «Салавей» М. Крошнера), Васіля («Князь-возера» В. Залатарова, Дзярж. прэмія СССР 1950), Янкі («Палымяныя сэрцы» на тую ж музыку Залатарова). З інш. роляў на сцэне Бел. т-ра: Гірэй («Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева), Зігфрыд («Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага), Базыль («Дон Кіхот» Л. Мінкуса), Ма Лі-чэн («Чырвоны мак» Р. Гліэра). Пастаноўкі: балеты «Чырвоны мак» (1950), «Эсмеральда» Ц. Пуні (1951), «Лаўрэнсія» А. Крэйна (1955), «Карсар» А. Адана (1957), «Блакітны Дунай» на муз. І. Штраўса (1958). Спалучаў добрае сцэнічнае аблічча з уменнем пранікаць у стыль і характар вобразаў, з тэмпераментнасцю і адухоўленасцю выканання. З 1971 маст. кіраўнік і гал. балетмайстар Дзярж. ансамбля танца БССР. Узнаг. 2 ордэнамі.





С. У. Дрэчын у ролі Янкі.

Літ.: Модэль М. Сямён Дрэчын, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.

Л. М. Ражанава. Мінск.

ДТСААФ СССР (Добраахвотнае таварыства садзеяння арміі, авіяцыі і флоту), масавая абаронна-патрыя-

тычная арг-цыя працоўных. Засн. ў 1951 у выніку зліцця т-ваў ДТСАРМ, ДТСАВ і ДТСФЛОТ. У 1927—48 існаваў Асаавіяхім (т-ва садзеяння абароне, авіяц. і хім. буд-ву). Прапагандуе ваен. веды, рыхтуе моладзь да вайсковай службы, развівае ваенна-тэхн. віды спорту. Кіраўніцтва ажыццяўляе ЦК ДТСААФ, у рэспубліках — камітэты (рэспубліканскія, абласныя, раённыя, гарадскія, пярвічныя). Школы і клубы ДТСААФ у БССР за 1966—70 падрыхтавалі кожнага другога шафёра, 432 186 спартсменаў-разраднікаў, у т. л. 236 майстроў спорту і 498 кандыдатаў у майстры. ЦК ДТСААФ выдае газ. «Советский патриот», час. «Военные знания», «За рулём», «Крылья Родины», «Радио».

ДУА Гершан Майсеевіч (парт. псеўд. Д. Боген; 5.5.1892, г. Седлец — 12.11.1948), дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. За рэвалюц. дзейнасць у 1916—18 зняволены ням. акупац. ўладамі ў канцлагеры. У 1918 выбраны чл. Варшаўскага Савета рабочых дэпутатаў. У 1920 эміграваў у Палесціну, адзін з заснавальнікаў і генеральны сакратар ЦК кампартыі Палесціны. Высланы англ. калан. ўладамі. У 1925—32 чл. ЦК КПЗБ, Бюро ЦК, краявога сакратарыята, прадстаўнік ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б. Няраз арыштоўваўся ўладамі бурж. Польшчы. У 1933—35 у апараце Выканкома Камінтэрна. У 1937 у складзе паліт. кіраўніцтва Інтэрнацыянальных брыгад рэспубліканскай Іспаніі. Пасля разгрому рэспублікі эміграваў у Францыю, пасля на Кубу, дзе ўдзельнічаў у парт., культ.-асвет. рабоце, быў карэспандэнтам камуніст. друку ў ЗША. З 1947 у ПНР.

ДУАЁН (франц. doyen), асоба, якая ўзначальвае дыпламатычны корпус у якой-н. краіне. Звычайна Д.— вышэйшы рангам дыпламат. прадстаўнік. Калі некалькі дыпламат. прадстаўнікоў маюць аднолькавы ранг, то Д.— асоба, якая пайдаўжэй знаходзіцца ў той ці інш. краіне (з моманту ўручэння *вярыцельных грамат*).

ДУАЛІЗМ (ад лац. dualis дваісты), такое вырашэнне *асноўнага пытання філасофіі*, калі ў процілегласць *манізму* сцвярджаецца існаванне дзвюх самастойных першаасноў (субстанцый) — ідэальнай і матэрыяльнай. Д. накіраваны на прымірэнне ідэалізму і матэрыялізму, затушоўвае партыйнасць філасофіі і ў выніку вядзе да ідэалізму.

У Ст. Грэцыі Д. упершыню выявіўся ў рэліг.-маральным вучэнні орфікаў (8—6 ст. да н. э.). Яны разглядалі цела чалавека як «турму душы», а душу як бессмяротную і боскую першаснову. У Платона антрапалагічны Д. орфікаў спалучаўся з Д. этычным, у якім адрозніваліся пачуццёвая (амаральная, схільная да ўсяго злога) і духоўная (маральная) прырода чалавека. Метафізічны Д. развіў Дэкарт. Ён тлумачыў быццё на аснове дапушчэння дзвюх самастойных субстанцый: матэрыяльнай, атрыбут якой — працягласць, і духоўнай, атрыбут якой — мысленне. Кант у сваёй філасофіі прапагандаўляе пачуццёвы свет дадзенага ў вопыце звышадчувальнай апрыёрнай форме свядомасці. Пазней Д. набывае цалкам антынавук. ідэаліст. характар. У цеснай сувязі з Д. у бурж. філасофіі ўзнікла канцэпцыя *псіхафізічнага паралелізму*, які сцвярджае незалежнасць фізічных і псіхічных станаў чалавека.

Літ.: Гл. пры арт. *Ідэалізм*. *У. М. Саўута*. Мінск.

ДУБ (Quercus), род вечназялёных і лістападных дрэў і кустоў сям. букавых. Вядома каля 600 відаў, пашыраных у паўн. паўшар'і і ў горах трапічнага пояса. У СССР 20 відаў, на Беларусі 2 у прыродных умовах і 7 інтрадукаванa.

Найб. пашыраны Д. звычайны, або летні (Q. robur) — дрэва выш. 30—40(50) *м* і 80—100(150) *см* у дыяметры. Лісце цэласнакрайняе, зубчастае або лопасцевае. Кветкі раздзельнаполыя, тычынкавыя ў доўгіх звіслых каташках, песцікавыя — адзіночныя. Плод — жалуд. Цвіце ў крас.— маі, жалуды выспяваюць у вер.— кастр. Жыве 400—500, іншы раз да 2000 гадоў. На Беларусі ахоўваецца больш за 40 дубоў-волатаў (гл. *Помнікі прыроды*). Развівае магутную каранёвую сістэму. Размнажаецца насеннем (жалудамі) і парасткамі ад пня. Пашыраны па ўсёй рэспубліцы, асабліва ў паўд. частцы, дзе ўтварае *дубровы*. Другі від — Д. скальны, або сядзячкаветны (Q. petraea), расце ў паўд.-зах. частцы рэспублікі (Белавежская пушча).

Д. у СССР і БССР — адна з асн. лесаўтваральных парод. Драўніна моцная і гнуткая, мае высокія фіз.-тэхн. ўласцівасці і прыгожую тэкстуру. Выкарыстоўваецца ў розных галінах прамысловасці і гаспадаркі. Драўніна і кара Д. багатыя на *дубільныя рэчывы* (у кары да 12%, у драўніне 5% танідаў). Кара ўжываецца ў медыцыне і ветэрынарыі. Жалуды ідуць на прыгатаванне сурагату кавы і на корм жывёле. Пірамідальная форма Д. выкарыстоўваецца ў зялёным будаўніцтве.



Дуб чарэшчаты: *1* — галінка з лісцем і кветкамі; *2* — плады.

Літ.: Юркевич И. Д. Феноформы и экотипы дуба черешчатого (Quercus robur L.), «Доклады АН БССР», 1964, т. 8, № 12; Парфенов В. И. Изменчивость дуба черешчатого (Quercus robur L.) и скального (Quercus petraea Liebl), произрастающих в Беловежской пуще, и возможность интрогрессивной гибридизации между ними, у кн.: Беловежская пуща, в. 3, Мн., 1969. *В. І. Парфёнаў*. Мінск.

ДУБАВІЦА, вёска ў Струкачоўскім с/с Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Камуніст». За 18 *км* на ПдЗ ад Кармы, 128 *км* ад Гомеля, 78 *км* ад чыг. ст. Рагачоў. 565 ж., гасп. 165 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, млын, лесапільня. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

ДУБАВОЕ, вёска ў Задроўеўскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны Кастрычнік». За 16 *км* на З ад Оршы, 72 *км* ад Віцебска, 17 *км* ад чыг. ст. Коханава, каля шашы Мінск — Масква (1 *км*). 186 ж., гасп. 72 (1971). Клуб, аддз. сувязі. Ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску.

ДУБАЕ, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл., на паўн. беразе Дняпроўска-Бугскага канала. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дубаеў». За 24 *км* на З ад Пінска, 150 *км* ад Брэста, 11 *км* ад чыг. ст. Юхнавічы, на шашы Пінск — Брэст. 677 ж., гасп. 189 (1971). Аддз. Пінскага рыбазавода, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячы дом інвалідаў, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Ням.-фаш. захопнікі спалілі больш за палову вёскі. Помнік 21 сав. воіну-земляку, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБАЙ, вёска ў Відзіборскім с/с Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 24 *км* на Пн ад Століна, 272 *км* ад Брэста, 10 *км* ад чыг. ст. Відзібор. 1832 ж., гасп. 553 (1971). Лясніцтва, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячая муз. школа, фельч.-ак. пункт, радзільны дом, аддз. сувязі, 3 магазіны. У Вял. Айч. вайну ў Д. дзейнічала падпольная камсамольская арг-цыя. Абеліск на ўшанаванне памяці 61 аднавяскоўца, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну; абеліск сакратару парт. арг-цыі калгаса Р. А. Зайцаву і сакратару камсамольскай арг-цыі В. А. Малею, якіх загубілі ў 1949 ворагі Сав. улады.

Каля Д. курганны могільнік. Складаецца з 3 курганных груп (за 3 *км* на У ад Д. і ва ўрочышчах Ваўлін і Задубенне). Даследаваўся Ю. У. Кухаронкам (1955—56). Раскапана 13 курганоў 3-й групы, знойдзены жал. наканечнікі коп'яў скіфскага і гальштацкага тыпу, нож, кругладонныя лянныя пасудзіны, залатая падвеска і інш. Адносіцца да рашняга перыяду мілаградскай культуры (сярэдзіна 1-га тысячагоддзя да н. э.).

Літ.: Кухаренко Ю. В. Памятники железного века на территории Полесья, М., 1961.

І. І. Андрайчук. Столін; *Л. Д. Побаль*. Мінск.

ДУБАНОСЫ, чатыры роды пеўчых птушак сям. ўюрковых атр. вераб'іных. Пашыраны ў Еўропе, Азіі, Паўн. Афрыцы, зах. частцы Паўн. Амерыкі. У СССР 4 віды, на Беларусі — уласна Д. (Coccothraustes coccothraustes).

Уласна дубанос.

Даўж. цела Д. да 28 *см*, маса да 80 *г*. Моцная шырокая і высокая дзюба. Уласна Д. мае светла-рыжую ці светла-каштанавую галаву, на горле чорную пляму, чорныя крылы. Гняздуецца ў лісцевых і мяшаных лясах, парках, садах. Гнёзды робіць на дрэвах. Нясе 4—5 шаравата-зялёных яец. Корміцца суквеццямі дуба, пладамі крушыны, рабіны, чаромхі, костачкамі вішань, насеннем граба, вольхі і інш. Шкодзіць садам, асабліва вішнёвым.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ДУБАХ Аляксандр Давыдавіч [27.6(9.7). 1883, в. Ботава Валакаламскага пав. Маскоўскай губ.— 1942], савецкі вучоны ў галіне с.-г. і лясных меліярацый. Д-р с.-г. н. (1926), праф. (1921). Скончыў Маск. с.-г. ін-т (1908). У 1908—16 інжынер-гідратэхнік па меліярацыі с.-г. і лясных зямель у Мінскай і Магілёўскай губ. Заг. кафедры с.-г. меліярацыі Горацкага с.-г. ін-та (1920—27). Заг. аддзела меліярацыі і культуры балотаў Бел. НДІ сельскай і лясной гасп. (1927—30). Старшыня Навукова-тэхн. савета пры Наркамземе БССР (1925—30). У 1927—42 заг. кафедры гідратэхн. меліярацыі лясных зямель Ленінградскай лесатэхн. акадэміі. Распрацоўваў пытанні лясной гідралогіі, гідралогіі балотаў, ушлыву лесу на рачны сцёк і інш.

Тв.: Математика в мелиорации, 2 изд., [Горки], 1925; (разам з Р. Спаро) Осушение болот открытыми канавами, М.— Л., 1930; Гидрология болот, Свердловск — М., 1944; Лес как гидрологический фактор, М.— Л., 1951.

ДУБАШЫНСКІ Павел Піліпавіч (н. 14.3.1931, в. Гарбуны Дзісенскага пав. Віленскага ваяводства), беларускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1966). Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (1955, педагог Л. Мазалеўская) у Бел. рэсп. т-ры юнага гледача, з 1967 у т-ры імя Я. Купалы. Выканаўца роляў герояў і характарных. Сярод іх: Караколь («Горад майстроў» Т. Габэ), Серада («Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага), Шпекін («Рэвізор» М. Гогаля), Ланс («Два вероцы» У. Шэкспіра), Прысыпкін («Клоп» У. Маякоўскага); у бел. рэпертуары — Лявон, Федзя («Папараць-кветка», «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела), Адась («За лясамі дрымучымі» А. Вольскага і П. Макаля), Ціхан («Адкуль грэх?» А. Петрашкевіча), Пракоп («Рудабельская рэспубліка» паводле С. Грахоўскага), Камендант («Трыбунал» А. Макаёнка).

ДУБІКАЎ Андрэй Еліферавіч [15(27).10. 1898, станіца Грушаўская Чаркаскай акр. Вобл. Войска Данскога — 3.7.1963], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1918. На фронце з 1941. Камандзір гарматы Д. вызначыўся каля в. Узрэчча Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. 25.6.1944 фарсіраваў Зах. Дзвіну, замацаваўся на плацдарме. Агнём гарматы знішчыў некалькі кулямётных кропак ворага і памог астатнім падраздзяленням фарсіраваць раку.

ДУБІЛЬНЫЯ РАСЛІНЫ, расліны, якія назапашваюць у каранях, карэнішчах, кары сцябла, драўніне, лісці, пладах дубільныя рэчывы, або таніды. У некат. раслін (дуб, сумах, бадан, фісташкавае дрэва і інш.) гэтыя рэчывы ёсць у *галах* (35—60%).

У СССР і на Беларусі з Д. р. растуць: піхта, елка, лістоўніца, хвоя, вярба, граб, бяроза, вольха, каштан, дуб, шчаўе, рэвень, каліна, крывасмок, джузгун, бадан, вятроўнік, дуброўка, кермек, талакнянка і інш. Д. р. ідуць на прамысл. выраб *дубільных рэчываў*, некаторыя (дуб, каліна, вольха шэрая, скумпія, крывасмок, эўкаліпт і інш.) выкарыстоўваюцца ў фармацэўтычнай прамысловасці і ў медыцыне для атрымання чыстага таніну і прэпаратаў з яго. Найб. багатая на дубільныя рэчывы і мае прамысл. значэнне сыравіна драўняных і травяністых (зялёных) дубільнікаў: кара некат. відаў вярбы, дуба, елкі, бярозы, акацыі серабрыстай; драўніна дуба, каштана; лісце сумаха, скумпіі; бадан, таран дубільны, шчаўе, вятроўнік і інш.

Літ.: Вопросы изучения и использования дубильных растений в СССР, М.— Л., 1963; Вульф Е. В. и Малеева О. Ф. Мировые ресурсы полезных растений. Справочник, Л., 1969.

ДУБІЛЬНЫЯ РЭЧЫВЫ, хім. злучэнні, здольныя мяняць калоідны стан бялкоў, што змяшчаюцца ў скуранай сыравіне, жалаціне ці казеіне. У БССР Д. р. здабываюць па Рэчыцкім з-дзе дубільных экстрактаў, пераважна з драўніны дубу.

Адрозніваюць мінеральныя і арган. Д. р. Мінеральныя — солі хрому, цырконію і алюмінію (гл. таксама *Галіны*) — ідуць на выраб мяккай скуры. Арган. бываюць раслінныя (таніды), жывёльныя (напр., ворвань) паходжання і сінтэтычныя (сінтаны). Часцей ужываюцца арган. Д. р. раслінныя паходжання (гл. *Дубільныя расліны*). Здабываюць таніды з здробненых драўнінных матэрыялаў экстрагаваннем гарачай вадой. Водныя растворы Д. р.

ужываюцца для дублення (вырабу) футры і скуры. Дубленне — аск. аперацыя гарбарнай і футравай вытворчасці, у выніку яго матэрыял становіцца больш тэрмаўстойлівы і ўстойлівы да дзеяння хім. рэагентаў, менш набракае і дэфармуецца. Д. р. ўжываюцца таксама ў тэкстыльнай, авіяцыйнай, харчовай і пластмасавай прамысловасці.

Літ.: Якадин А. И. и Егоров Б. А. Растительные дубильные материалы, М., 1968; Синтетические дубители, М., 1967; Левенко П. И. Использование химических материалов в кожевенной промышленности, М., 1968.


ДУБІН Ібрагім Хусанавіч (н. 16.5.1921, г. Астрахань), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў вер. 1943 каля в. Бярозкі Камарыпскага р-на Палескай вобл. Камандзір узвода Д. знішчыў варожы станковы кулямёт, захапіў рацыю. У баі за в. Пасудава авалодаў ням. кулямётам і адкрыў агонь па ворагу, гэтым памог сав. воінам вызваліць вёску. Жыве ў Астрахані.

ДУБІНА Антон Васілевіч (16.1.1885, г. Веліж Віцебскай губ.— 30.10.1937), савецкі ваенны і дзярж. дзеяч. З сям'і рамізніка. Чл. КПСС з 1918. З 1902 працаваў тэлеграфістам. Удзельнік рэвалюцыі 1905—07, 1-й сусв. вайны. Са студз. 1918 у Чырв. Арміі. Ваен. камісар Веліжскага, Ігуменскага, Мінскага пав., ваен. камендант г. Мінска, гомельскі губ. ваен. камісар. Вёў барацьбу з бандытызмам на Беларусі (1921—23). Пасля ваенком 2-й (Беларускай) і 7-й кав. дывізій, нам. наркома і нарком па ваен. справах БССР. З 1925 старшыня Магілёўскага акруговага выканкома, упаўнаважаны наркамата сувязі СССР па БССР, старшыня ЦК Асаавіяхіма БССР. На IX—XV з'ездах КП(б)Б выбіраўся чл. ЦК. Чл. ЦВК БССР (1920—21, 1924—37), кандыдат у чл. ЦВК СССР (1925—29). Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. *У. У. Грамовіч.* Мінск.

ДУБІНА Уладзімір Васілевіч [н. 11(24).5. 1906, в. Краснастаў Слуцкага пав. Мінскай губ.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1949). Удзельнік Айч. вайны. Да ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР (1939) парабак. У 1939—71 рабочы саўгаса «Чырвоная зорка» Клецкага р-на Мінскай вобл. Жыве ў в. Цапра Клецкага р-на.

ДУБІНА-БАЯРСКАЯ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр Узбелацкага с/с. За 11 *км* на Пн ад Валожына, 95 *км* ад Мінска, 10 *км* ад чыг. ст. Валожын. 345 ж., двароў 115 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДУБІНІН Мікалай Пятровіч [н. 22.12.1906 (4.1.1907)], савецкі генетык. Акад. АН СССР (1966, чл.-кар. 1946). Скончыў Маскоўскі ун-т (1928). Дырэктар ін-та агульнай генетыкі АН СССР (з 1966). Асн. працы па тэорыі *гена*, храмасомнай тэорыі спадчыннасці, па пытаннях мутацый. Абгрунтаваў тэорыю складанай будовы гена (1929), *эфект становішча* (з Б. М. Сідаравым), распрацаваў пытанне пра ролю генетыка-аўтам. працэсаў у папуляцыях, даследаваў хім. і радыяцыйны *мутагенез* і інш., эксперыментальна вызначыў дозы радыяцыі, якія падвойваюць частату мутацый у чалавека. Член 6 замежных акадэмій і навук. т-ваў. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі СССР, а таксама медалямі Мендэля (1965), Пуркіне (1965), Дарвіна (1968) і «За заслугі перад навукай і чалавецтвам» (1967). Ленінская прэмія 1966.



Тв.: Проблемы радиационной генетики, М., 1961; Молекулярная генетика и действие излучений на наследственность, М., 1963; Эволюция популяций и радиация, М., 1966; (разам з Я. Л. Глямбоцкім) Генетика популяций и селекция, М., 1967; Общая генетика, М., 1970.


Літ.: Н. П. Дубинин, «Генетика», 1967, № 1.
У. К. Сайчанка. Мінск.

ДУБІНІН Міхаіл Міхайлавіч [н. 19.12.1900 (1.1.1901), Масква], савецкі фізіка-хімік. Акад. АН СССР (1943). Герой Сац. Працы (1969). З 1946 заг. Аддзела сарбцыйных працэсаў Ін-та фіз. хіміі АН СССР, акад.-сакратар Аддзялення хім. навук АН СССР (1946—57). Адкрыў абарачэнне адсарбцыйных радоў, утварэнне кіслых паверхневых вокіслаў вугалю, распрацаваў эксперыментальныя і тэарэт. асновы працэсаў адсорбцыі газаў і пары з току паветра, стварыў (з супрацоўнікамі) тэорыю адсорбцыі газаў і пары мікрапарыстымі адсарбентамі, даў класіфікацыю структурных тыпаў адсарбентаў. Распрацаваў спосабы атрымання адсарбентаў з зададзенымі параметрамі порыстай структуры. Дзярж. прэміі СССР 1942 і 1950. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 5 інш. ордэнамі.



Літ.: Михаил Михайлович Дубинин, М.—Л., 1950 (Материалы к биобиблиографии ученых СССР); Беринг Б. П. и Серпинский В. В. Академик Михаил Михайлович Дубинин (к 60-летию со дня рождения), «Журнал физической химии», 1961, т. 35, в. 1.

«ДУБІНКА», часопіс сатыры і гумару, дадатак да газ. «Звезда». Выдаваўся ў Мінску ў 1924. Гл. *Літаратурныя дадаткі.*



ДУБІНСКІ Сяргей Антонавіч [13(25).10.1884, в. Наройкі Бельскага пав. Гродзенскай губ.— 27.8.1937], беларускі савецкі археолаг. З сялян. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1914). Працаваў настаўнікам. З 1925 чл. Гістар.-археал. камісіі Інбелкульта, з 1931 у Ін-це гісторыі АН БССР, з 1933 у Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (Ленінград). Вёў раскопкі курганоў і каменных магіл у Бельскім пав., даследаваў гарадзішчы і могільнікі Міншчыны, Магілёўшчыны і Віцебшчыны.

Тв.: Доследы культур жалезнага перыяду на Віцебшчыне, Магілёўшчыне і Міншчыне, «Запіскі Аддзела гуманітарных навук», 1928, кн. 5; Чаркасаўскае гарадзішча пад Оршай.— Гарадзішча каля в. Германоў Аршанскай акругі.— Доследы культур жалезнага перыяду на БССР у 1929, там жа, 1930, кн. 11; Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін, Мн., 1933.
Т. М. Каробушкіна. Мінск.

ДУБІНЫ, вёска ў Аніскавіцкім с/с Кобрыпскага р-на Брэсцкай вобл., на ўсх. беразе Арэхаўскага канала. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 31 *км* на У ад Кобрына, 76 *км* ад Брэста, 9 *км* ад чыг. ст. Гарадзец. 193 ж., гасп. 54 (1971). Сярэд. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБІЦКІ Еўдакім Прохаравіч (1887, в. Ротна Сенненскага пав. Магілёўскай губ.— 19.1. 1919), удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу ў Сярэдняй Азіі.



З сялян. Чл. КПСС з ліст. 1917. За рэвалюц. дзейнасць у 1908 высланы ў Арэнбургскую губ. У 1917 у Бузулуку ўзначальваў камісарыят па кіраўніцтве чыгункамі, удзельнічаў у стварэнні Чырв. гвардыі і разгроме контррэвалюц. мяцяжу. З снеж. 1917 камісар службы руху Арэнбургскай чыг. Адзін з арганізатараў Арэнбургскага сав. палка і камандуючы групы войск па ліквідацыі контррэвалюц. сіл у Закаспійскай вобл. Пазней нар. камісар шляхоў зносін і чл. ЦВК Туркестанскай АССР. Расстраляны ў час контррэвалюц. мяцяжу 18—22.1.1919 у Ташкенце ў ліку 14 туркестанскіх камісараў. Імем Д. названа вуліца ў Ташкенце, 29.4.1962 на Вакзальнай пл. адкрыты помнік 14 туркестанскім камісарам.

Літ.: Носько М. Белоруссия и Узбекистан, Мн., 1970.

ДУБІЦКІЯ, беларускія гравёры па шкле і майстры мастацкага ткацтва 18—1-й палавы 19 ст. Выхадцы з дробнай шляхты Бабруйскага пав. Тры пакаленні Д. працавалі на мануфактурах кн. Радзівілаў — шкляных у Налібоках і Урэччы (гл. *Урэцка-налібоцкае шкло*), ткацкай у Слуцку.

Мікалай (г. н. невяд.— п. 1794), рысавальшчык, гравёр люстэркаў і посуднага шкла. Працаваў у Налібоках (1728—39), Урэччы (1739—75 і 1781—94), на Чарнобыльскай гуце Хадкевічаў (1775—81). Яго работы вызначаліся вытанчанай кампазіцыяй (на свецкія і рэліг. тэмы), пластычнасцю ліній, дакладнай мадэліроўкай фігур, багаццем арнаменту (маскароны, сімвалічная і рэліг. эмблематыка), тэхн. дасканаласцю. Прызначаліся для каралеўскага двара, патрэб Радзівілаў, магнатаў, буйной шляхты.

Ян (г. н. і см. невяд.), гравёр посуднага шкла 2-й пал. 18 ст. Вучань Мікалая Дубіцкага. Працаваў у Налібоках. Творы яго ўнікальныя, гравіроўка вызначалася вытанчанасцю ліній і чысцінёю выканання. Улюбёны арнаментальны матыў — сэрцайкі. Сярод работ 1781—84 — гравіроўка некалькіх сервізаў для двара караля Станіслава Аўгуста.

Пётр (г. н. і см. невяд.), гравёр па шкле 2-й пал. 18 ст. Працаваў ва Урэччы. Ствараў партрэты і кветкавыя арнаментальныя кампазіцыі. Гравёрамі па шкле ў 2-й пал. 18 ст. былі і яго браты Ежы, Казімір, а ў 1-й пал. 19 ст. Тэадор і Кароль.

Юзаф (г. н. і см. невяд.), майстар тканых паясоў 1-й пал. 19 ст. Працаваў у Слуцку. У 1835 з братам Піліпам (таксама майстрам тканых паясоў) стаў арандатарам Слуцкай мануфактуры.

Літ.: Kamieńska Z. Manufaktura szklana w Urzeczu. 1737—1846, Warszawa, 1964; Buczkowski K. Dawne szkła artystyczne w Polsce, Kraków, 1958.
М. М. Яніцкая. Мінск.

ДУБІЧАЙ, паселішча ранняга неаліту (4-е тысячагоддзе да н. э.) у Вярэнскім р-не Літ. ССР. Даследавалася Р. К. Рымантене (1962). Пры раскопках знойдзены фрагменты лепных посудзін з раслінай дамешкай і крамянёвыя прылады працы. Помнікі, падобныя на помнікі з Д., вядомыя на ПнЗ Беларусі.

Літ.: Римантене Р. К. Стоянки раннего неолита в юго-восточной Литве, у кн.: Древности Белоруссии, Мн., 1966.
М. М. Чарняўскі. Мінск.

ДУБЛІН (англ. Dublin, ірл. Baile Atha Cliath), сталіца Ірландыі. Размешчаны на У краіны, у вусці р. Ліфі на беразе Дублінскага зал. Ірландскага м. Вял. марскі порт (4/5 грузаабароту знешняга гандлю Ірландыі). Вузел чыгунак і аўтамаб. дарог, міжнар. аэрапорт. 568,8 тыс. ж. (1969). Найб. развіта харчовая (асабліва піваварная, мукамольная, спірта-гарэлачная, кандытарская) прамысловасць. Прадпрыемствы шкларобнай, ільняной, швейнай, маш.-буд., суднабуд., металаапр. прамысловасці. З-ды штучнага ўгнаення. Нац. ун-т (з 1909), Трыніты коледж (засн. ў 1591), Акадэмія навук, Акадэмія мастацтваў. Музеі: Нац. галерэя, Галерэя сучаснага мастацтва, Нац. музей навукі і мастацтва і інш. Тэатр «Абі». Бат. сад. Заапарк.

Упершыню ўпамінаецца ў 3 ст. З 9 ст. да 1014 пад уладай парманаў. У 1170 захоплены англ. феадаламі. З 17 ст. адзін з цэнтраў ірл. вызв. руху. У 1869 у Д. створана секцыя 1-га Інтэрнацыянала. У жн. 1913 адбылася 5-месячная стачка трамвайшчыкаў і гарадскіх рабочых, у якой удзельнічала 30 тыс. чал. У крас. 1916 Д.— гал. арэна магутнага нац.-вызв. паўстання ірл. народа супраць англ. панавання. Са снеж. 1921 адм. цэнтр брыт. дамініёна Эйрэ, з 1949 сталіца Ірландскай Рэспублікі. Сярэдневяковыя цэрквы — Крайст-чорч (1038, перабудавана ў 1172—1225) і сабор Сент-Патрык (1190, адноўлены пасля пажару 1362). Планіроўка цэнтра (1757) і яго ансамблі ў стылі класіцызму. З помнікаў архітэктуры: парламент (1745—48), ратуша (1769), Чарліманг-хаўс (1763—70, арх. У. Чэймберс), пабудовы Дж. Гэндана (таможня, 1781—91, будынак Чатырох Судоў, 1786—1800, Каралеўскі суд, 1795). План рэканструкцыі Д. складзены П. Аберкрамбі ў 1913; пабудаваны аўтавакзал (1951—53, арх. М. Скот), аэравакзал (1937—41, арх. Д. Фіцджэралд).

ДУБЛІН, вёска ў Спярыжскім с/с Брагінскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Гагарына. За 6 *км* на ПдУ ад Брагіна, 136 *км* ад Гомеля, 34 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 511 ж., гасп. 165 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДУБЛІРАВАННЕ (ад франц. doubler падвойваць), паралельны, адпаможны, падобны ці аналагічны выраб (выкананне) чаго-небудзь. У кіно — стварэнне новай фанаграмы кінафільма на іншай мове. Пры Д. абавязковая сінхранізацыя рухаў губ акцёра на экране і дублёра.

ДУБНА, вёска ў Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе Нёмана. Цэнтр сельсавета і калгаса «Дубна». За 11 *км* на ПнЗ ад Мастоў, 54 *км* ад Гродна, 10 *км* ад чыг. ст. Чарлёна, на шашы Масты — Скідаль. 1135 ж., гасп. 381 (1971). Павільён быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. У часы бурж. Польшчы (1921—39) у Д. дзейнічалі падпольныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі. Помнік 72 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДУБНІЦЫ, вёска ў Стайкаўскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 22 *км* на ПнЗ ад Оршы, 60 *км* ад Віцебска, 4 *км* ад чыг. ст. Стайкі. 210 ж., гасп. 71 (1971). Клуб, б-ка, магазін.

ДУБОВІК Сямён Андрэевіч [парт. псеўд. Андрэй; 4(16).2.1888, в. Нароўшчына Пружанскага павета Гродзенскай губ.— 1937], удзельнік грамадз. вайны, дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З сялян. Чл. КПСС з 1912. У 1909 эміграваў у ЗША. За рэвалюц. дзейнасць у канцы 1911 высланы з ЗША, вярнуўся ў Расію. Працаваў на Ленскіх капальнях. Удзекшы ад паліцыі пасля ленскіх падзей, працаваў у Маскве. Двойчы (у 1914 і 1917) арыштаваны і сасланы. Пасля Лют. рэв. працаваў у Петраградзе і ў Маскве. У грамадз. вайну пач. аддзела забеспячэння 2-й Укр. брыгады, камісар палка. З 1921 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі. Адзін з стваральнікаў КПЗБ; удзельнік І канфер. КПЗБ (кастр. 1923), сакратар Брэсцкага акруговага к-та КПЗБ. 13.7.1924 арыштаваны і 19.1.1926 прыгавораны да 4 гадоў турмы. Вызвалены 22.7.1928, працаваў у апараце ЦК КПЗБ. З 1930 у СССР на адм.-гаспадарчай рабоце.



ДУБОВІК Уладзімір Аляксандравіч [н. 24.6 (7.7).1903, засценак Немча Бабруйскага пав. Мінскай губ.], генерал-лейтэнант (1959). З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны на Паўд. фронце. Да 1940 у Ген. штабе РСЧА, потым у Забайкальскай ваен. акрузе. З крас. 1944 камандзір дывізіі. Удзельнік вайны з імперыял. Японіяй. З 1945 на розных пасадах у арміі, вышэйшых ваенна-навуч. установах і ў Мін-ве абароны СССР, ваен. аташэ. З 1968 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

ДУБОВІКІ, вёска ў Емяльянаўскім с/с Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Высокае». За 7,5 *км* на ПнЗ ад Смалявіч, 45,5 *км* ад Мінска, на шашы Смалявічы — Лагойск. 138 ж., гасп. 48 (1971).

ДУБОВЫ ЛОГ, вёска ў Мар'інскім с/с Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 13 *км* на Пн ад Добруша, 43 *км* ад Гомеля, 15 *км* ад чыг. ст. Добруш. 378 ж., двароў 133 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У вер. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 30 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБОВЫ ШАЎКАПРАД, насякомае сям. паўлінавочак атр. лускакрылых. Разводзяць, каб атрымліваць прыродны шоўк. Найб. пашыраны кітайскі Д. ш. (Antheraea pernyi), дае 2 пакаленні за год. Культывуюць у Кітаі, Японіі, Карэі, Індыі. Добра акліматызуецца ў СССР. На Беларусі ў эксперым. выкармках вусені кормяцца на дубе, бярозе, вярбе, грабе. Яны звіваюць *коканы*, пры размотванні якіх атрымліваюцца шаўковыя ніткі ад 1,5 да 5 *км*. Шоўк Д. ш. грубейшы і мацнейшы за шоўк тутавага шаўкапрада; выкарыст. на выраб часучы, у прыладабудаванні, эл.-тэхніцы, медыцыне.




Дубовы шаўкапрад: *1* — самка; *2* — самец; *3* — вусень.

Літ.: Дубовый шелкопряд, М., 1951; Синицкий Н. Н и др. Разведение дубового шелкопряда, Киев, 1952. *У. А. Радкевіч.* Віцебск.

ДУБОЎКА Тамара Аляксандраўна (падпольны псеўд. Тамара; 3.10.1918, в. Марачы Аршанскага пав. Магілёўскай губ.— 21.3.1966), адна з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольскага падполля ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. Партызанка. З сялян. Чл. КПСС з 1944. З ліп. 1941 на падпольнай рабоце ў Лёзненскім р-не; арганізоўвала падпольныя камсамольска-маладзёжныя групы. З чэрв. 1942 сакратар Лёзненскага падпольнага РК ЛКСМБ і нам. камісара *партызанскай брыгады імя А. Ф. Данукалава*; вяла паліт. работу сярод моладзі, удзельнічала ў баявых аперацыях. З кастр. 1943 на камсамольскай, сав. і гасп. рабоце. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі. *Н. І. Дарафеенка.* Віцебск.

ДУБОЎКА Уладзімір Мікалаевіч [н. 2(15).7.1900, в. Агароднікі Вілейскага пав. Віленскай губ.], беларускі савецкі паэт. З сялян. Скончыў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю (1918), вучыўся ў Маск. ун-це, настаўнічаў на Тульшчыне (1918—20). У 1920—21 у Чырв. Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў інспектарам Наркамата асветы РСФСР і займаўся ў Выш. літ.-маст. ін-це імя Брусава. Адказны сакратар пастпрэдства БССР пры ўрадзе СССР (1923—24), лектар Камуніст. ун-та народаў Захаду (1924—27). У 1922—25 рэдактар беларускага тэксту «Весніка ЦВК, СНК і СПА Саюзу ССР», у 1926—30 — «Збору законаў і загадаў рабоча-сялянскага ўраду Саюзу ССР». Працаваў на розных работах у Грузіі, на Д. Усходзе, у Краснаярскім краі (1930—58). Быў членам літ. аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», рэдактарам час. «Беларускі піянер». Друкуецца з 1921. Як паэт сфарміраваўся пад уплывам рэвалюцыі. У творчасці 20-х г. паказваў веліч здзейсненых Кастрычнікам перамен, радасць буд-ва новага жыцця, паглыбляў гуманіст. пафас родных л-ры. У аб. вершаў «Строма» (Вільня, 1923), «Трысцё» (Мінск, 1925), «Credo» (Мінск, 1926), «Наля» (Масква, 1927), паэме «Там, дзе кіпарысы» (1925) паказваў духоўную біяграфію маладога чалавека паслякастрычніцкай пары, змагара за перамогу сацыялізма. Вершы і паэмы Д. 20-х г. вылучаліся высокай паэт. культурай і мелі ўплыў на творчасць маладых паэтаў. У гістар. мінулым знаходзіў вобразы людзей магутнай сілы волі, чыстых пачуццяў, узвышаных імкненняў (паэмы «Браніслава», 1929; «Крычаўская спакуса», 1959, першая рэд. «Грахі чубатыя», нап. 1925). У паэмах «Кругі» (1927), «І пурпуровых ветразей узвіны» (1929; асобн. выд. Вільня, 1939), «Штурмуйце будучыні авангосты» (нап. 1929) — праблемы ўзаемаадносін жыцця і мастацтва. Творы Д. вызначаюцца рамант. узорыстасцю метафар, навізною рыфмаў, паліфанічнасцю гучання. Рамант. ўзнёсласць спалучаецца ў іх з філас. разважлівасцю. Лірыка Д. 50—60-х г.— далейшае развіццё матываў красы роднай зямлі і духоўнага хараства сав. чалавека (аб. «Палеская рапсодыя», 1961, літ. прэмія імя Я. Купалы 1962). Аўтар аповесцей «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969), шматлікіх паэт. апрацовак нар. казак і легендаў («Як сінічок да сонца лётаў», 1961; «Дзівосныя прыгоды», 1963; «Мілавіца», 1964, і інш.). Вядомы як перакладчык твораў У. Шэкспіра («Санеты», 1964), Дж. Г. Байрана (паэмы «Шыльёнскі вязень», «Бронзавы век», містэрыя «Каін»), Ю. Славацкага, У. Сыракомлі і інш. Выступае з крытычнымі артыкуламі. Творы Д. перакл. на рус., укр., літ., груз. і інш. мовы. Жыве ў Маскве.

Тв.: Выбр. тв., Мн., 1959; Выбр. тв., т. 1—2, Мн., 1965; Цудоўная знаходка, Мн., 1960; Кветкі — сонцавы дзеткі, Мн., 1963; Казкі, Мн., 1968; [Вершы], Мн., [1970]; Мой жыццяпіс, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.



Літ.: Бугаёў Дз. Уладзімір Дубоўка, Мн., 1965; Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 1, Мн., 1964; Броўка П. Шэдэўр сусветнай паэзіі, «Полымя», 1961, № 1; Ярош М. Маладое натхненне паэта, там жа, 1961, № 10; Сіпакоў Я. У краіне дзіцячай радасці, там жа, 1964, № 4; Лойка А. і Пшыркоў Ю. Уладзімір Дубоўка, там жа, 1964, № 10; Іх жа. Жменя кляновых лістоў, там жа, 1970, № 7; Грахоўскі С. Паэт — заўсёды паэт, «Маладосць», 1970, № 7; Ліс А. Моц і харство паэтычнага слова, там жа, 1960, № 7; Гардзіцкі А. Дыялогі, Мн., 1968, с. 47—62. *Ю. С. Пшыркоў.* Мінск.

ДУБОЎСКІ Анатоль Ігнатавіч (н. 18.8.1922, в. Цясова Слуцкага пав. Мінскай губ.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1946. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў БДУ імя Леніна (1953). З 1950 старшыня калгаса імя Чкалава Салігорскага р-на Мінскай вобл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: (Разам з А. Я. Ваўчком) Выращивание раннего картофеля. (Колхоз им. Чкалова Солигорского района), Мн., 1967.

ДУБОЎСКІ Канстанцін Мікалаевіч (н. 18.3.1923, в. Іканы Барысаўскага пав. Мінскай губ.). Герой Сац. Працы (1971), заслужаны механізатар БССР (1969). Чл. КПСС з 1950. Удзельнік партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Скончыў Паўночна-Заходні політэхн. ін-т (Ленінград, 1958). У 1958—64 на гасп. і сав. рабоце ў Мінскім, Клецкім і Крупскім р-нах Мінскай вобл. З 1965 дырэктар Мінскай птушкафабрыкі імя Крупскай. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Фабрика яиц и мяса птицы, Мн., 1969.

ДУБРАВА, вёска ў Аляхновіцкім с/с Маладзечанскага р-на Мінскай вобл., каля вытокаў Бярэзіны (прыток Нёмана). Цэнтр саўгаса «Дубрава». За 40 *км* на ПдУ ад Маладзечна, 45 *км* ад Мінска, 4 *км* ад чыг. ст. Дубровы, на аўтамаб. дарозе г. п. Радашковічы — в. Ракаў. 763 ж., двароў 227 (1971). Спірт. з-д, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. 28.6.1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 23 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБРАЎКА, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Дубраўка». За 25 *км* на ПдЗ ад Оршы, 107 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Копысь. 235 ж., гасп. 81 (1971). Швейная майстэрня. Клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБРАЎКА, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл., на р. Вуць. Цэнтр сельсавета. За 41 *км* на ПдУ ад Добруша, 52 *км* ад Гомеля, 12 *км* ад чыг. ст. Церахоўка, 565 ж., двароў 183 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 20 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБРАЎКА, вёска ў Кастрычніцкім с/с Крупскага р-на Мінскай вобл., каля воз. Сялява (2 *км*). Цэнтр саўгаса «Дубраўка». За 45 *км* на Пн ад Крупак, 161 *км* ад Мінска, 41 *км* ад чыг. ст. Крупкі. 276 ж., двароў 82 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ДУБРАЎКА, вёска ў Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Дзватцара. За 33 *км* на У ад Ушачаў, 100 *км* ад Віцебска, 55 *км* ад чыг. ст. Полацк, на шашы г. п. Ушачы — Ула. 285 ж., гасп. 89 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Ням.-фаш. захопнікі расстралялі 35 мірных жыхароў вёскі. Помнік на брацкай магіле 20 сав. воінаў і партызанаў, абеліск 210 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДУБРО́, возера ў бас. р. Абабіцы, левага прытока Друйкі, у Браслаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,02 *км*². Даўж. 2,3 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,4 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Схілы пад ворывам. У сярэдняй ч. невялікі востраў. Вадазбор (19,8 *км*²) узгорыста-марэнны. Д. злучана пратокай з воз. Берца; сцёк у воз. Абаб'е. Водзяцца плотка, шчупак, ліпь, акунь, карась, лешч, сазан; ёсць вугор.

ДУБРО́ Антон Вікенцьевіч [н. 1(14).10.1900, в. Нарушова Дрысенскага пав. Віцебскай губ.], генерал-маёр інтэнданцкай службы (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў вышэйшыя акад. курсы (1948). У Чырв. Арміі з мая 1919. Удзельнік грамадз. вайны на Паўн., Зах. і Паўд. франтах. У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Сталінградскім, Паўд., 2-м Укр. франтах — нач. тылу арміі. Удзельнік Сталінградскай бітвы. З 1946 нач. тылу ваен. акругі і флоту. З 1954 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 8 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Ленінградзе.

ДУБРОВА, шыракалісты лес з пераважаю дубу. Пашыраны ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы; у СССР — у Еўрап. ч. і на Д. Усходзе. На Беларусі растуць на супескавых і суглінкавых дзярнова-падзолістых глебах: у паўд. частцы — грабовыя Д. (9,9% укрытай лесам плошчы), у цэнтр.— ялова-грабовыя (3,4%), у паўн.— яловыя (1,6%). Тыпы Д.: арляковая, кісліцавая, спіткавая, крапіўная, папарацевая, злакавая і інш. Бел. Д. высокапрадукцыйныя, у сярэднім II банітэту (запас драўніны да 675 *м*³/*га*), маюць водаахоўнае і глебаахоўнае значэнне. Найб. вядомыя буда-каталёўскія, белавежскія, жорнаўскія, васілевіцкія і тураўскія Д.

Літ.: Дубравы СССР, т. 1—4, М.— Л., 1940—52; Юркевич И. Д. Дубравы Белорусской ССР и их восстановление, 2 изд., Мн., 1960.

І. Д. Юркевіч. Мінск.

ДУБРО́ВА, вёска ў Хваставіцкім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Расія». За 12 *км* на ПнЗ ад Глуска, 182 *км* ад Магілёва, 21 *км* ад чыг. ст. Старыя Дарогі. 526 ж., гасп. 169 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін.

ДУБРО́ВА, вёска ў Старавысокаўскім с/с Ельскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 30 *км* на З ад Ельска, 207 *км* ад Гомеля. 287 ж., двароў 97 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Вёску ў ліп. 1943 спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 25 мірных жыхароў. Курган Славы на ўшанаванне памяці 166 воінаў-землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і жыхароў вёскі, загубленых ням.-фаш. захопнікамі.

ДУБРО́ВА, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны Кастрычнік». За 8 *км* на З ад Лельчыц, 223 *км* ад Гомеля, 75 *км* ад чыг. ст. Ельск. 1556 ж., гасп. 410 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. 2 помнікі: на брацкай магіле сав. воінаў і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБРО́ВА, вёска ў Палескім с/с Светлагорскага р-на Гомельскай вобл., на р. Іпа. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 30 *км* на З ад Светлагорска, 140 *км* ад Гомеля, 27 *км* ад чыг. ст. Светлагорск-на-Бярэзіне, 20 *км* ад прыстані Парычы на Бярэзіне, на шашы г. п. Азарычы — в. Казлоўка. 586 ж., двароў 193 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У 1941 і 1943 ням.-фаш. карнікі загубілі 110 мірных жыхароў Д., у снеж. 1943 спалілі вёску. Помнікі на брацкіх могілках 797 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБРО́ВЕНСКІ РАЁН, у складзе Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Знаходзіцца на ПдУ вобласці, па берагах Дняпра. Пл. 1,3 тыс. *км*². Нас. 32,1 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 10 сельсаветаў; рабочы пасёлак Асінторф. Цэнтр г. Дуброўна.

Рэльеф на Пн раўнінны, на Пд хвалісты (Смаленскае ўзв.). Выш. 150—220 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу — 9,8 млн. *т* (у т. л. Шчэрбінскі Мох — 5 млн. *т*); 4 радовішчы цагельнай сыравіны — 9 млн. *м*³; радовішча буд. пяскоў Стражава — 1,4 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —7,8, ліп. 18 °С. Ападкаў 627 *мм* за год. Вегет. перыяд. каля 185 дзён. З ПнУ на ПдЗ цячэ Дняпро з прытокамі Мярэя, Расасенка, Дубровенка (левыя), Чыжоўка (правы); на Пн — Вярхіта, цячэ праз азёры Афанасьеўскае і Казённае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (58,4%), дзярнова-падзолістыя забалачаныя (29,2%), дзярнова і дзярнова-карбанатныя забалачаныя (7,9%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя (4,5%). З мінер. глебаў 89% суглінкавых, 11% супясчаных. Пад лесам 15% тэр. Найб. лясістасць на Пн раёна. Пераважаюць бяроза, асіна, вольха, на Пд елка, дуб. Насяляюць раён беларусы, рускія і інш. Сярэдняя шчыльн. 24,7 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 30,2%.

Прамысл. прадпрыемствы: на базе торфапрадпрыемства «Асінторф» пабудаваны (1970) торфабрыкетны з-д; ільнозавод, маслазавод, камбінат буд. матэрыялаў, хлебакамбінат, з-д жалезабетонных вырабаў Міжкалгасбуда, камбінат быт. абслугоўвання, раённае і спецыялізаванае аддзяленні Сельгастэхнікі (Дубторфе. У раёне 15 калгасаў і 7 саўгасаў (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Дабрынь)*, «Герой працы» *(Сваташыцы)*, «Гігант» *(Ляхайка)*, імя XX з'езду КПСС *(Вялікая Дзяцель)*, імя XXI з'езду КПСС *(Фесейка)*, імя Дзяржынскага *(Баева)*, «Звязда» *(Вялікае Бахава)*, «Іскра Ільіча» *(Рэдзькі)*, «Кастрычнік» *(Ірэяніца)*, «На варце» *(Піраві)*, «Прагрэс» *(Баброва)*, «Праўда» *(Сілішчава)*, «40 гадоў Кастрычніка» *(Якубава)*, «Усход» *(Чырына)*, «Шлях да камунізма» *(Ерамеёўшчына)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Арловічы» *(Арловічы)*, «Зарубы» *(Зарубы)*, «Перамога» *(Засценкі)*, «1 Мая» *(Станіслава-ва)*, «Прыдняпроўскі» *(Ляды)*, імя Ю. Смірнова *(Буда)*, імя Чарнухоўскага *(Калінаўка)*.

С. гасп. спецыялізуецца на льнаводстве, малочна-мясной жывёлагадоўлі і свінагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 62% тэр. На пач. 1971 асушана 10,2 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 55,9, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 24,9, бульбай 5,7, тэхнічнымі 3,6, кармавымі культурамі 21,5. На пач. 1971 у раёне было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 35,2, у т. л. кароў 16,6; свіней 22,6, авечак і коз 8,0. Транспарт чыгуначны і аўтамабільны. Чыгунка Орша — Смаленск. Аўтамаб. дарога Мінск — Масква; ад Дуброўна ідуць аўтамаб. дарогі на Оршу, Горкі, Асінторф, Ляды, Баева.

На пач. 1971 у раёне было 12 сярэдніх, 13 васьмігадовых, 47 пач. школ, 2 школы рабочай і сельскай моладзі; 9 дашкольных установ, 74 масавыя б-кі, 26 клубных устаноў, 42 кінаўстаноўкі, у т. л. 37 стацыянарных; 5 бальніц, 2 урачэбна-амбулаторныя ўчасткі, 15 фельч.-ак. пунктаў, 2 пункты аховы здароўя; працавала 429 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 31 інжынер, 21 аграном, 25 эканамістаў і бухгалтараў, 19 заатэхнікаў, 20 вет. урачоў, 230 настаўнікаў, 30 урачоў і інш.; 120 чал. з незакончанай вышэйшай адукацыяй, 930 — з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Дняпроўская праўда».

А. А. Шайрова. Мінск.

Літ.: Дубравы СССР, т. 1—4, М.— Л., 1940—52; Юркевич И. Д. Дубравы Белорусской ССР и их восстановление, 2 изд., Мн., 1960.

І. Д. Юркевіч. Мінск.

ДУБРО́ВА, вёска ў Хваставіцкім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Расія». За 12 *км* на ПнЗ ад Глуска, 182 *км* ад Магілёва, 21 *км* ад чыг. ст. Старыя Дарогі. 526 ж., гасп. 169 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, сталовая, магазін.

ДУБРО́ВА, вёска ў Старавысокаўскім с/с Ельскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 30 *км* на З ад Ельска, 207 *км* ад Гомеля. 287 ж., двароў 97 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. Вёску ў ліп. 1943 спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 25 мірных жыхароў. Курган Славы на ўшанаванне памяці 166 воінаў-землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і жыхароў вёскі, загубленых ням.-фаш. захопнікамі.

ДУБРО́ВА, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны Кастрычнік». За 8 *км* на З ад Лельчыц, 223 *км* ад Гомеля, 75 *км* ад чыг. ст. Ельск. 1556 ж., гасп. 410 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. 2 помнікі: на брацкай магіле сав. воінаў і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.


ДУБРО́ВА, вёска ў Палескім с/с Светлагорскага р-на Гомельскай вобл., на р. Іпа. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 30 *км* на З ад Светлагорска, 140 *км* ад Гомеля, 27 *км* ад чыг. ст. Светлагорск-на-Бярэзіне, 20 *км* ад прыстані Парычы на Бярэзіне, на шашы г. п. Азарычы — в. Казлоўка. 586 ж., двароў 193 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У 1941 і 1943 ням.-фаш. карнікі загубілі 110 мірных жыхароў Д., у снеж. 1943 спалілі вёску. Помнікі на брацкіх могілках 797 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУБРО́ВЕНСКІ РАЁН, у складзе Віцебскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Знаходзіцца на ПдУ вобласці, па берагах Дняпра. Пл. 1,3 тыс. *км*². Нас. 32,1 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 10 сельсаветаў; рабочы пасёлак Асінторф. Цэнтр г. Дуброўна.

Рэльеф на Пн раўнінны, на Пд хвалісты (Смаленскае ўзв.). Выш. 150—220 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу — 9,8 млн. *т* (у т. л. Шчэрбінскі Мох — 5 млн. *т*); 4 радовішчы цагельнай сыравіны — 9 млн. *м*³; радовішча буд. пяскоў Стражава — 1,4 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —7,8, ліп. 18 °С. Ападкаў 627 *мм* за год. Вегет. перыяд. каля 185 дзён. З ПнУ на ПдЗ цячэ Дняпро з прытокамі Мярэя, Расасенка, Дубровенка (левыя), Чыжоўка (правы); на Пн — Вярхіта, цячэ праз азёры Афанасьеўскае і Казённае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (58,4%), дзярнова-падзолістыя забалачаныя (29,2%), дзярнова і дзярнова-карбанатныя забалачаныя (7,9%), тарфяна-балотныя і алювіяльныя

Піянерскі лагер у ўрочышчы Лугаўцы Дубровенскага раёна.





(4,5%). З мінер. глебаў 89% суглінкавых, 11% супясчаных. Пад лесам 15% тэр. Найб. лясістасць на Пн раёна. Пераважаюць бяроза, асіна, вольха, на Пд елка, дуб. Насяляюць раён беларусы, рускія і інш. Сярэдняя шчыльн. 24,7 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 30,2%.

Прамысл. прадпрыемствы: на базе торфапрадпрыемства «Асінторф» пабудаваны (1970) торфабрыкетны з-д; ільнозавод, маслазавод, камбінат буд. матэрыялаў, хлебакамбінат, з-д жалезабетонных вырабаў Міжкалгасбуда, камбінат быт. абслугоўвання, раённае і спецыялізаванае аддзяленні Сельгастэхнікі (Дубторфе. У раёне 15 калгасаў і 7 саўгасаў (1971).


Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Дабрынь)*, «Герой працы» *(Сваташыцы)*, «Гігант» *(Ляхайка)*, імя XX з'езду КПСС *(Вялікая Дзяцель)*, імя XXI з'езду КПСС *(Фесейка)*, імя Дзяржынскага *(Баева)*, «Звязда» *(Вялікае Бахава)*, «Іскра Ільіча» *(Рэдзькі)*, «Кастрычнік» *(Ірэяніца)*, «На варце» *(Піраві)*, «Прагрэс» *(Баброва)*, «Праўда» *(Сілішчава)*, «40 гадоў Кастрычніка» *(Якубава)*, «Усход» *(Чырына)*, «Шлях да камунізма» *(Ерамеёўшчына)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Арловічы» *(Арловічы)*, «Зарубы» *(Зарубы)*, «Перамога» *(Засценкі)*, «1 Мая» *(Станіслава-ва)*, «Прыдняпроўскі» *(Ляды)*, імя Ю. Смірнова *(Буда)*, імя Чарнухоўскага *(Калінаўка)*.

С. гасп. спецыялізуецца на льнаводстве, малочна-мясной жывёлагадоўлі і свінагадоўлі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 62% тэр. На пач. 1971 асушана 10,2 тыс. *га* забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 55,9, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 24,9, бульбай 5,7, тэхнічнымі 3,6, кармавымі культурамі 21,5. На пач. 1971 у раёне было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 35,2, у т. л. кароў 16,6; свіней 22,6, авечак і коз 8,0. Транспарт чыгуначны і аўтамабільны. Чыгунка Орша — Смаленск. Аўтамаб. дарога Мінск — Масква; ад Дуброўна ідуць аўтамаб. дарогі на Оршу, Горкі, Асінторф, Ляды, Баева.

На пач. 1971 у раёне было 12 сярэдніх, 13 васьмігадовых, 47 пач. школ, 2 школы рабочай і сельскай моладзі; 9 дашкольных устаноў, 74 масавыя б-кі, 26 клубных устаноў, 42 кінаўстаноўкі, у т. л. 37 стацыянарных; 5 бальніц, 2 урачэбна-амбулаторныя ўчасткі, 15 фельч.-ак. пунктаў, 2 пункты аховы здароўя; працавала 429 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 31 інжынер, 21 аграном, 25 эканамістаў і бухгалтараў, 19 заатэхнікаў, 20 вет. урачоў, 230 настаўнікаў, 30 урачоў і інш.; 120 чал. з незакончанай вышэйшай адукацыяй, 930 — з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Дняпроўская праўда».

А. А. Шайрова. Мінск.

Комплекс жылых дамоў у в. Станіслава.



ДУБРО́ВІНСКІ Іосіф Фёдаравіч (парт. псеўд. Інакенцій, Леанід; 26.8.1877, с. Пакроўскае-Ліпаўцы Малаархангельскага пав. Арлоўскай губ.— 19.5.1913), прафесійны рэвалюцыянер. У рэвалюц. руху з 1893. Адзін з кіраўнікоў «Маскоўскага рабочага саюза». Агент ленінскай «Искры». Пасля II з'езду РСДРП (1903) бальшавік, кааптаваны ў ЦК. Вёў парт. работу ў Самары, Адэсе, Екацярынаславе, Кіеве, Пецярбурзе, Маскве. Удзельнік рэвалюц. выступленняў маракоў Краштата (1905), адзін з кіраўнікоў Снежанскага ўзбр. паўстання ў Маскве (1905). На V (Лонданскім) з'ездзе РСДРП (1907) выбраны чл. ЦК. У 1908 чл. рэдакцыі бальшавіцкай газ. «Пролетарий», у 1909 чл. Замежнага бюро ЦК РСДРП. Арыштаваны ў Парыжы, выдадзены царскаму ўраду. Пакончыў з сабой у Бутырскай турме.



кай газ. «Пролетарий». Вёў барацьбу супраць адзавізму, ліквідатарства, філас. рэвізіянізму. Няраз арыштоўваўся (1897, 1905, 1906, 1908, 1910), загінуў у туруханскай ссылцы. У. І. Ленін, крытыкуючы Д. за прымірэнцкія памылкі, высока цаніў яго як аднаго з арганізатараў партыі бальшавікоў.

Літ.: Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 2, с. 204 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 2, с. 435)]; Крееер А. М. Иосиф Дубровинский (Инокентий), М., 1962.

ДУБРОВІЧ Алесь (сапр. Рэдзька Аляксей Рыгоравіч; 1910, в. Галубічы Дзісенскага пав. Віленскай губ.— снеж. 1941), беларускі паэт. З сялян. Удзельнік вызв. руху ў Зах. Беларусі. Арыштаваны ў 1934, адбыў 2 гады ў віленскай турме на Лукішках. Пасля вызвалення Зах. Беларусі (1939) выбраны старшынёй сельсавета. Друкавацца пачаў (1928) у прагрэс. газ. «Доля працы». Грамадз. паэзія Д. ўслаўляла гераіку змагання за свабоду роднага краю, выкрывала сац. і нац. ўціск, сцвярджала багацце духоўнага свету ўдзельнікаў вызв. руху, заклікала мастакоў слова верна служыць прац. люду. Яна арганічна спалучае публіцыст. пафас і мяккі лірызм. Расстраляны ням.-фаш. захопнікамі.



Тв.: У кн.— Сцягі і паходні, Мн., 1965; Крывёю сэрца, Мн., 1967.

Літ.: Таўлай В. Алесь Дубровіч, у кн.: Мы іх не забудзем, Мн., 1949. *У. А. Калеснік.* Брэст.

ДУБРОВЫ, вёска ў Чапаеўскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Жданава. За 38 *км* на ПнУ ад Верхнядзвінска, 213 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад шашы Верхнядзвінск — Себеж (РСФСР). 380 ж., гасп. 110 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, магазін. У сакавіку 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 502 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 40 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. За 1 *км* на Пд ад Д. гарадзішча днепра-дзвінскай культуры. Адкрыта В. Главёнкам у 1925, даследавалася К. П. Шутам у 1965. Пры раскопках знойдзены касцяныя праколкі, долаты, крамянёвыя сякеры, рэшткі гладкасценных ляпных пасудзін 5—2 ст. да н. э., косці свойскіх і дзікіх жывёл.

ДУБРОЎКА (Potentilla), род шмат-, радзей адна-, двухгадовых травяністых раслін і паўкустоў сям. ружакветных. Вядома каля 200 відаў. У СССР 175, на Беларусі 18 відаў.



Дуброўка прамастойная: *1* — верхняя частка расліны; *2* — ніжняя частка расліны; *3* — кветка; *4* — плады.

Выш. сцябла да 1 *м*. Лісце пальчата- або перыстаскладанае ці рассечанае. Кветкі жоўтыя, белыя, ружовыя або цёмна-чырвоныя ў шчытках- падобных суквецціях, радзей адзіночныя. Найб. пашыраныя на Беларусі: Д. гусіная (P. anserina, нар. назвы: срэбнік, гарлянка белая, лапнік), Д. серабрыстая (P. argentea, нар. назвы: жабнік, срэбнік, гартанная трава), Д. прамастойная (P. erecta, нар. назвы: дзеравяшка, перавяжыха, сурмаліна). Растуць у лясах, на балотах, лугах, уздоўж дарог. Маюць у карэнішчах дубільныя рэчывы. Прапараты Д. прамастойнай ужываюцца ў медыцыне. Некат. віды выкарыстоўваюцца як дэкаратыўныя.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ДУБРОЎКА, вёска ў Казянскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «За мір». За 67 *км* на Пд ад Браслава, 297 *км* ад Віцебска, 35 *км* ад чыг. ст. Паставы. 296 ж., гасп. 98 (1971). Лясніцтва, лесапільня, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 50 мірных жыхароў.

ДУБРОЎНА, горад, цэнтр Дубровенскага р-на Віцебскай вобл., на Дняпры. За 94 *км* на ПдУ ад Віцебска, 8 *км* ад чыг. ст. Асіпаўка. 6,4 тыс. ж. (1971).

У 1-й пал. 16 ст. горад, вялікакняскае ўладанне. З сярэдзіны 16 ст. належаў магнатам Глябовічам, пазней Сапегам, Любамірскім. У 1750 у Д. засн. суконная мануфактура. Існавала праваслаўнае брацтва. З 1772 Д. ў складзе Рас. імперыі, з 1773 горад, цэнтр павета Аршанскай правінцыі, з 1777 мястэчка Аршанскага пав. Магілёўскай губ., у канцы 19 — пач. 20 ст. Горацкага пав. Магілёўскай губ. У канцы 18 ст. ў Д. было 3 мануфактуры (пазументная, суконная і гадзіннікавая) з 279 рабочымі. У 1900 у Д. каля 5 тыс. ж. У пач. 20 ст. тут засн. Дняпроўская мануфактура (у 1910— 488 рабочых). Працоўныя Д. актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. Сав. ўлада ўстаноўлена 1 ліст. 1917. У 1939 было 9,9 тыс. ж. У Айч. вайну горад акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (ліп. 1941 — 26.6.1944) і разбураны. Пасля вайны адноўлены.

Прадпрыемствы: ільнозавод, маслазавод, камбінат буд. матэрыялаў (вытворчасць цэглы, шыферу), хлебакамбінат, з-д жалезабетонных вырабаў Міжкалгасбуда, камбінат быт. абслугоўвання, раённае і спецыялізаванае аддзяленні Сельгастэхнікі. 2 сярэдняя, васьмігадовая школы, школа рабочай моладзі, дзіцячыя спарт. і муз. школы, сельскае прафес.-тэхн. вуч. механізацыі с. гасп., 2 дзіцячых ясляў-садоў, дзіцячы дом, Дом піянераў, 3 б-кі, Дом культуры, бальніца. Помнік У. І. Леніну. Помнік на брацкай магіле Героя Сав. Саюза Г. А. *Нікандравай*, сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

А. П. Грыцкевіч. Мінск; *М. Л. Карнеенка.* Дуброўна.

Дуброўна. Цэнтральная плошча.



ДУБРОЎНЯ, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Мічурына. За 5 *км* на У ад Ліды, 117 *км* ад Гродна, 2 *км* ад чыг. ст. Гутна, каля шашы Ліда — в. Ліпніцкі (1,5 *км*). 252 ж., гасп. 63 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ДУБРОЎСКІ Віктар Паўлавіч (н. 15.12.1927, Варонеж), рускі і беларускі савецкі дырыжор. Засл. арт. БССР (1959), нар. арт. РСФСР (1969). Скончыў Маск. кансерваторыю па класах скрыпкі (1949) і сімф. дырыжыравання (1953). З 1952 дырыжор-асістэнт Дзярж. сімф. аркестра СССР. У 1956—62 гал. дырыжор Дзярж. сімф. аркестра БССР. Першы інтэрпрэтаваў многія творы бел. кампазітараў. Адначасова выкладаў у Бел. кансерваторыі. З 1962 маст. кіраўнік Дзярж. рус. нар. аркестра імя Осіпава.

ДУБРОЎСКІ Ігнат [сапр. Чарняўскі Ігнат Цімафеевіч; н. 22.8(4.9).1906, в. Дуброва Мінскага пав.], беларускі савецкі пісьменнік і эканаміст. Канд. с.-г. н. (1937). Чл. КПСС з 1928. З сялян. Скончыў Бел. с.-г. акадэмію (1932). У 1937—41 і в 1945 у Ін-це эканомікі АН БССР. Удзельнік Айч. вайны. Першыя вершы надрукаваны ў 1927. Аўтар аб. апавяд. «Радня» (1954), аповесцей «Зямля маладзее» (1952), «Зямныя вузлы» (1965), нарыса «Светлы шлях» (1958). Героі твораў Д.— людзі калгаснай вёскі, рабочыя, студэнты, вучоныя. Надзённасць тэматыкі, рэальныя жыццёвыя канфлікты, мяккі гумар — вызначальныя рысы твораў пісьменніка. Як вучоны даследуе эканоміку с. гасп. Беларусі. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Паўз самыя вокны. Апавяданні, Мн., 1961; Да долі чалавечай. Нарыс-хроніка, Мн., 1970; Не поле перайсці..., у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966; Перспективы свеклосеяния и развития сахарной промышленности в БССР, Мн., 1948 (пад сапр. прозв.); Значение правильных суадносін галін у развіцці грамадскай гаспадаркі калгасаў, Мн., 1955 (пад сапр. прозв.); Источники и темпы накопления в колхозах БССР, Мн., 1970, гл. 1—2.

Літ.: Варановіч С. Апавяданні пра моладзь, «Беларусь», 1954, № 8; Васільеў Б. Яркі, таленавіты нарыс, «Полымя», 1959, № 10; Лобан М. Слова пра сябра, там жа, 1966, № 9.

І. У. Саламевіч. Мінск.

ДУБРОЎСКІ Фёдар Фаміч [22.3(4.4).1901, в. Замошша Полацкага пав. Віцебскай губ.— 3.3.1970], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943), ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Вышэйшую цэнтр. калг. школу (1932). У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны на Зах. фронце. З 1929 старшыня калгаса, сельсавета, дырэктар МТС. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну арганізатар падполля ў Віцебскай вобл., камандзір партыз. атрада, *партызанскай брыгады Чашніцкай* («Дубава»). У 1944—53 сакратар Чашніцкага РК КП(б)Б, дырэктар саўгасаў імя Леніна, «Новыя Зялёнкі».




ДУБЯГА Дзмітрый Іванавіч [21.9(3.10).1849, с. Соіна Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ.— 22.10.1918], рускі астраном. Скончыў у 1872 Пецярбургскі ун-т. Працаваў у Пулкаўскай астр. абсерваторыі. У 1884—1918 дырэктар Казанскай абсерваторыі, з 1901 дырэктар заснаванай ім паблізу Казані абсерваторыі імя Энгельгарта. У 1899—1905 рэктар Казанскага ун-та. Навук. працы па тэарэт. астраноміі, астраметрыі і гравіметрыі. Даследаваў арбіту спадарожніка Нептуна, стварыў тэорыю руху малой планеты Дыяны. Па назіраннях казанскіх астраномаў склаў каталог 4281 зоркі.

Літ.: Лаврова Н. В. (скл.). Библиография русской астрономической литературы 1800—1900 гг., М., 1968 (Труды Гос. астрономического ин-та им. П. К. Штернберга, т. 37); Баранов В. А. Памяти Дмитрия Ивановича Дубяго (3 октября 1849 — 22 октября 1918), Казань, 1919.

ДУГАВАЯ ЛЯМПА, крыніца моцнага святла, якое ўзнікае пры гарэнні *электрычнай дугі* паміж вугальнымі электродамі. Ужываецца ў пражэктарах, кінапраекц. апаратах і інш.


ДУГАВАЯ ЭЛЕКТРАЗВАРКА, від *электрычнай зваркі*, пры якім вырабы звараюцца *электрычнай дугой*. Дуга запальваецца паміж электродам і вырабамі (залежная дуга, рыс. 1) або толькі паміж электродамі (незалежная). Цяпло



Рыс. 1. Схема зваркі залежнай дугой: *1* — выраб; *2* — слой шлаку; *3* — зварное шво; *4* — металічная частка электрода; *5* — покрыва электрода.

але (т-ра больш за 5000 °С) плавіць метал вырабаў і электрода (пры няплаўкім электродзе — прысадачнага прутка). У месцы звараванне ўтвараецца ванна вадкага металу, які, астываючы, моцна злучае вырабы. Пры Д. э. выкарыстоўваецца пастаянны (ад матор-генератара, выпрамніка) ці пераменны (ад зварачнага трансфарматара) ток. Д. э.— асн. спосаб зварвання металаў і іх сплаваў (а таксама шкла, фарфору, пекат. пластмас, мінералаў і інш.). Пашырана пры вытворчасці *зварных канструкцый* у розных галінах тэхнікі. Выкарыстоўваецца таксама для наплаўлення, часам для рэзання металу.

Адкрыта ў 1882 рус. вынаходнікам М. М. Бернардосам. У 1888 інж. М. Г. Славянаў распрацаваў спосаб Д. э. металічным плаўкім электродам. Ён пабудаваў і першы зварачны генератар пастаяннага току. Удасканаленая сав. вучонымі і інжынерамі Д. э. набыла прамысл. значэнне, амаль цалкам замяніла клёпанне і інш. малапрадукцыйныя спосабы злучэння металаў. Адрозніваюць зварку плаўкім і няплаўкім (вугальны, вальфрама-



Рыс. 2. Тыпы злучэнняў пры дугавой электразварцы канструкцый.

вы, металакерамічны і інш.) электродамі, зварку ў ахоўным асяроддзі, якое стабілізуе дугу і робіць яе больш якасным *(газаэлектрычная зварка)*, пад слоем флюсу (звычайна *аўтаматычная зварка*); падводную. Асн. тыпы зварных злучэнняў пры Д. э.: стыкавае (рыс. 2, *а*, *б*, *в*), таўровае (*г*), унакладку (*д*). Пры зварцы тонкага металу звычайна робяць адбартоўку краёў (*е*).

Літ.: Фоминых В. П. Оборудование и технология дуговой сварки, М., 1966; Патон Б. Е. и Лебедев В. К. Электрооборудование для дуговой и шлаковой сварки, М., 1966; Демянцевич В. П. Металлургические и технологические основы дуговой сварки, М.—Л., 1962; Радунский Л. Д. Развитие техники электрической дуговой сварки металлов в России, М.—Л., 1959; Евсеев Р. Е. Электродуговая сварка в электромонтажном производстве, М., 1968.

У. А. Чайка. Мінск.

ДУГАВАЯ ЭЛЕКТРЫЧНАЯ ПЕЧ, печ, награванне ў якой ажыццяўляецца цеплавой энергіяй эл. дугі. Гл. *Электрычная печ.*

ДУГЛАС (Douglass) Фрэдэрык (люг. 1817—20.2.1895), амерыканскі паліт. дзеяч, рэвалюц. дэмакрат, актыўны ўдзельнік негрыцянскага вызв. руху. Нарадзіўся ў сям'і раба ў штаце Мэрыленд. У 1838 уцёк на Пн, актыўна ўдзельнічаў у абаліцыянісцкім руху, набыў папулярнасць як выдатны прамоўца і публіцыст. У 50-я г. Д. пад уплывам Дж. *Браўна* выступіў за ўзбр. барацьбу супраць рабства. У гады грамадз. вайны ў ЗША 1861—65 актыўны ўдзельнік фарміравання негрыцянскіх палкоў. Пасля вайны выступаў за тое, каб надзяліць неграў зямлёю, за роўныя правы з белымі.

Літ.: Иванов Р. Ф. Фредерик Дуглас — руководитель революционного крыла аболиционистского движения, у кн.: К столетию гражданской войны в США, М., 1961; Грэхем Ш. Фредерик Дуглас, пер. с англ., М., 1959.

ДУДА (валынка), духавы музычны інструмент з дзвюх і болей трубак, устаўленых у мяшок (са скуры ці пузыра), які надзімаецца праз трубку (соску).



Дудар Хвёдар Ціхановіч з в. Домжарыцы Барысаўскага пав. Пач. 20 ст.

Адна ці некалькі трубак маюць трысцінкі (пішчыкі) і балавыя адтуліны і прызначаны для выканання мелодыі, астатнія (адна ці некалькі) — бурдонныя (кожная цягне адзін гук). Д. пад рознымі назвамі вядомая ў многіх народаў; да канца 19 ст. была адным з асн. інструментаў нар. муз. побыту беларусаў.

ДУДАКОВІЧЫ, вёска ў Круглянскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Гнілка. Цэнтр Ляспянскага с/с і калгаса «Кастрычнік». За 8 *км* па ПнУ ад Круглага, 102 *км* ад Магілёва, 28 *км* ад чыг. ст. Талачын. 329 ж., гасп. 101 (1971). Пач. школа, клуб, аддз. сувязі.

ДУДАР Алесь (сапр. Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч; 24.12.1904, в. Навасёлкі Мазырскага пав. Мінскай губ.— 25.2.1946), беларускі савецкі паэт. Сын беззямельнага селяніна. Вучыўся на літ.-лінгвістычным адд-не пед. ф-та БДУ. Літ. дзейнасць пачаў у 1921. Паэт ярка выражанага грамадз. тэмпераменту. У зб. вершаў «Беларусь бунтарская» (1925), «Сонечнымі сцежкамі» (1925), «І залацісцей, і сталёвей» (1926), «Вежа» (1928) услаўляў Кастрычнік, выяўляў пачуцці чалавека, акрыленага рэвалюцыяй, з захапленнем пісаў пра сацыялісг. буд-ва. Многія вершы (балады «Машыніст», «Камуністка», «Трыццаць пяць»), паэмы «Шанхайскі шоўк» (1926) і «Слуцак» (1934) прасякнуты героікай рэвалюц. барацьбы. Аўтар твораў пра сацыялісг. пераўтварэнне горада і вёскі (паэмы «Вайна за мір», 1932; нізка вершаў «Палескія ночы», нап. 1936). Выступаў у прозе (прыгодніцкі раман пра грамадз. вайну «Ваўчаняты», 1925, з А. Александровічам і А. Вольным) і ў крытыцы (пад псеўд. Тодар Глыбоцкі — зб. арт. «Пра літаратурныя справы», 1928). Перакладаў творы А. Пушкіна, А. Блока, І. В. Гёта, Ф. Шылера, Г. Гейнэ, рус. сав. паэтаў. У літ. дзейнасці Д. былі асобныя памылкі нацыяналіст. характару.



Тв.: Выбр. тв., Мн., 1959.
Літ.: Гілевіч Н. С. Акрыленая рэвалюцыяй, Мн., 1962, с. 73—76, 104—113, 141—147; Зʼонак А. Жывое паэтава слова, «Полымя», 1964, № 12.

ДУДЗІНКА, горад, цэнтр Таймырскай (Долгана-Ненецкай) нац. акругі Краснаярскага краю РСФСР. Рачны і марскі порт у нізоўі Енісея. Чыг. зносіны з Нарыльскам. 19,8 тыс. ж. (1970). Мясцовая прамысловасць. Краязнаўчы музей. Заснавана Д. ў 17 ст.

ДУДЗІНСКАЯ Наталля Міхайлаўна [н. 8(21).8.1912, Харкаў], руская савецкая артыстка балета і педагог. Нар. арт. СССР (1957). Скончыла Ленінградскае харэагр. вучылішча (1931, клас А. Ваганавай). У 1931—63 адна з вядучых танцоўшчыц Ленінградскага т-ра оперы і балета імя Кірава. Побач з асн. партыямі класічнага рэпертуару выканала шмат роляў у сав. балетах: Лаўрэнсія («Лаўрэнсія» А. Крэйна), Параша («Медны конік» Р. Глізэра), Золушка («Золушка» С. Пракоф'ева), Сары («Сцежкаю грому» К. Караева) і інш. З 1951 педагог т-ра імя Кірава, з 1965— Ленінградскага харэагр. вучылішча. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1947, 1949, 1951. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ДУДЗІЧ Захар Захаравіч [н. 4(17).8.1913, в. Шацілы Мінскага пав.], беларускі савецкі эканаміст. Д-р эканам. н. (1969), праф. (1970). Чл. КПСС з 1940. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Бел. дзярж. ін-т нар. гасп. імя Куйбышава (1939). У 1948—53 у БДУ: выкладчык, дацэнт кафедры палітэканоміі. З 1953 заг. кафедры палітэканоміі Бел. політэхн. ін-та. Даследуе ўзаемасувязь эканам. закона ў матэрыяльных інтарэсаў у сацыялісг. гр-ве.

Тв.: Аб шляхах будаўніцтва камунізма, Мн., 1959; Закон планомерного развития социалистического народного хозяйства, Мн., 1959; Экономические законы и их использование в строительстве коммунизма, Мн., 1965; (разам з І. І. Самадзеевым) Экономические законы социализма в действии, Мн., 1968.

ДУДЗІЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дудзічы». За 9 *км* на ПнУ ад Калінкавіч, 129 *км* ад Гомеля, на шашы Бабруйск — Калінкавічы. 736 ж., дварoў 236 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, кафэ, магазін. Помнік на брацкай магіле 27 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУДКА, беларускі духавы музычны інструмент; драўляная або чарацяная трубка са свістковым прыстасаваннем і 6 круглымі адтулінамі.

Гукарад звычайна адпавядае дыятанічнай мажорнай гаме. Спрактыкаваныя музыканты праз напоўнае прыкрыццё адтулін выконваюць на Д.



і храматычны гукарад. Займае адно з першых месцаў у гістар. муз. інструментарыі беларусаў. Удасканаленыя Д. уведзены ў Дзярж. нар. аркестр БССР. Тэрмін Д. ўжываецца і як агульная назва нар. муз. інструментаў тыпу падоўжных флейтаў.

ДУДКОЎ Дзяніс Аляксандравіч [10(23).6.1904, мяст. Круглае Магілёўскага пав.— 23.3.1948], беларускі савецкі гісторык. З сялян. Скончыў БДУ (1928). У 1931—41 працаваў у Ін-це гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Ін-це гісторыі АН БССР, БДУ і Мінскім пед. ін-це. Удзельнік Айч. вайны. З 1945 дацэнт БДУ і Мінскага пед. ін-та, навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. Вывучаў сац.-эканам. адносіны на Беларусі, рабочы і сялянскі рух 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. Давёў беспадстаўнасць сцвярджэнняў нацыяналіст. гісторыкаў пра бясклясавасць бел. нацыі, аднароднасць сялянства, натуральны характар сялянскай гаспадаркі. У працах Д. ўпершыню ў бел. гістарыяграфіі з марксісцкіх пазіцый даследаваны структура і ўзровень развіцця прамысловасці, крыніцы фарміравання пралетарыяту, капіталіст. эвалюцыя памешчыцкай і сялянскай гаспадаркі, перажыткі прыгонніцтва, класавая дыферэнцыяцыя сялянства. Адзін з рэдактараў «Дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі» (т. 2, 1940).

Тв.: Сталыпінская рэформа ў Віцебскай губерні, Мн., 1931; Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й пал. XIX і пач. XX ст., Мн., 1932.

В. П. Панюціч. Мінск.

ДУДНІК (Angelica), род двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. парасонавых. Вядома калі 50 відаў, пашыраных у паўн. зоне Еўропы, Азіі, у Паўн. Амерыцы. У СССР 16 відаў, на Беларусі адзін — Д. лясны (A. silvestris, пар. назвы: дзягель, заечы кроп, ствольнік).



Дудзік лясны: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — карэнішча; *3* — кветка; *4* — плод.

Сцябло высокае (да 2 *м*), пустое. Лісце двойчы-тройчы перыстарассечанае. Кветкі белыя або ружаватыя, сабраныя ў складаныя парасонікі. Расце ў хвойных, мяшаных і бярозавых лясах, на лугах і мохавых балотах. Лек. расліна. Добры меданос.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ДУДО Пятро (Пётр Дзмітрыевіч; 4.9.1911, в. Забалацце Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 23.2.1958), беларускі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1939. З сялян. Скончыў Камуністычны ін-т журналістыкі ў Мінску (1940). З 1935 у Сав. Арміі. У 1940—41 нам. рэдактара газ. «Вольная праца» (Беласток). Удзельнік Айч. вайны. З 1949 карэспандэнт газ. «Во славу Родины». Аўтар нарысаў, апавяданняў, аповесці «Першы салют» (1958), сатыр. камедыі «Чортаў туэін» (1963). Узнаг. 4 ордэнамі, медалямі.

ДУДЧЫК Ніна Пятроўна (н. 16.4.1923, в. Каталёва Пружанскага пав. Палескага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). З 1951 звеняявая па вырошчванні лёну ў калгасе «Бальшавік» (з 1957 саўгас «Брэсцкі») Брэсцкага р-на, з 1957 заг. жывёлагадоўчай фермы (з 1970 ферма ў складзе саўгаса «Маладая гвардыя») гэтага ж раёна.

ДУДЧЫК Павел Андрэевіч (н. 12.7.1918, в. Казённыя Поршні Аршанскага пав.), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1938. Скончыў артыл. школу (1939) і ваен.-паліт. вучылішча (1942). У Айч. вайну на Калінінскім, Паўн.-Зах., 2-м Прыбалт., 1-м і 4-м Укр. франтах. Вызначыўся ў баях за в. Берзі каля Ліепаі (Латвія). Артыл. батарэя на чале з Д. заняла абарону і за 6 гадзін адбіла 11 варожых контратак, падбіла некалькі танкаў. З 1960 палкоўнік Д. у запасе. Працуе на Мінскім аўтамаб. з-дзе.



ДУЖАЎКА, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Проня. Цэнтр сельсавета і калгаса «Перамога». За 21 *км* на Пд ад Чавусаў, 69 *км* ад Магілёва, 17 *км* ад чыг. ст. Чавусы, на аўтамаб. дарозе Чавусы — Слаўгарад. 275 ж., гасп. 94 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, антэка, аддз. сувязі, 2 магазіны. У кастр. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнікі на 3 брацкіх магілах сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУЗЭ (Duse) Элеанора (3.10.1858, г. Віджавана, Італія —21.4.1924), італьянская актрыса. З акцёрскай сям'і. Выступала ў італьян. вандроўных трупах, у 1887 арганізавала ўласную. Шмат гастралявала па краінах Еўропы і Амерыкі (у 1891—92 і 1908 у Расіі). Актрыса трагічнага плана. Лепшыя ролі: Тэрэза Ракен (аднайм. п'еса Э. Заля), Маргарыта Гацье («Дама з камеліямі» А. Дзюма-сына), Сантуц-

ца («Сельскі гонар» Дж. Верга), Клеапатра («Антоній і Клеапатра» У. Шэкспіра), Нора («Нора» Г. Ібсена), Мірандаліна («Карчмарка» К. Гальдоні), Ганна («Мёртвы горад» Д'Анунцыо). Дэмакр. і гуманіст. мастацтва Д. вызначалася праўдзівасцю, філігранным майстэрствам.

Літ.: Топуридзе Е. Элеонора Дузе. Очерк жизни и творчества, М., 1960.

ДУКАТ (ад позналац. ducatus герцагства), буйная срэбраная манета Італіі 12—пач. 13 ст.; залатая еўрапейская манета 13—19 ст. масаю 3,4 *г*.

Залаты Д. упершыню выпушчаны ў 1252 у Генуі, пазней у Фларэнцыі (фларын), у 1284 у Венецыі (цэхін), у 14 ст. Германіяй (гульдэн) і інш. дзяржавамі. Першы польскі Д. (злоты) выпушчэн у 1320, а канца 15 ст. існаваў як лікавая і грашовая адзінка (чырвоны злоты). Рэгулярная эмісія польскага, а пазней літоўскага Д. усталявалася пасля грашовай рэформы 1526—28. У Расіі Д. адпавядаў *чырвонцу*, упершыню выпушчаны ў 1701. У 1735—1868 Санкт-Пецярбургскі манетны двор тайна чаканіў залатыя манеты, якія капіравалі галандскі Д. На Беларусі ў 15—19 ст. былі ў абарачэнні венгерскія, польскія, літоўскія, галандскія і інш. Д.

Літ.: Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970; Рябцевич В. И. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968.

В. І. Рабцэвіч, Мінск.

ДУКОРА, балота ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл. За 1 *км* на У ад г. п. Рудзенск. Утварылася ў пасляледавіковым паніжэнні рэльефу. Жыўленне атм. ападкамі і грунтавымі водамі. Плошча накладаў торфу 1209 *га*. Торф на 45% вярховага тыпу, 20 пераходнага і 15% мяшанага. Макс. магутнасць пласта 5,3 *м*, сярэдняя 1,85 *м*. Падсцілаецца сапрапелем. Балота асушана і з'яўляецца эксперым. базай тарфяной доследнай станцыі Ін-та торфу АН БССР. З надвойных відаў торфу на доследным з-дзе хім. прамысловасці БССР вырабляюць горны воск.

ДУКОРА, вёска ў Пухавіцкім р-не Мінскай вобл., на р. Свіслач. Цэнтр сельсавета і калгаса імя 16 партызанаў. За 27 *км* на ПнУ ад Мар'інай Горкі (адм. ц. раёна), 38 *км* ад Мінска, 13 *км* ад чыг. ст. Рудзенск, на скрыжаванні аўтамаб. дарог Мінск—Вабруйск і Рудзенск—Смілавічы. 2258 ж., дварОў 707 (1970). У мінулым мястэчка, спачатку дзярж. маёмасць, пазней уладанне Сапегаў, Агінскіх, у канцы 18 ст. Манюшкаў і Оштарпаў; аноштм у пач. 19 ст. належаў прыгонны цырк. У грамадз. вайну пенадалёку ад Д. дзейнічаў партыз. атрад (гл. *Дукорскія партызаны*). У пушчы помнік 16 дукорскім партызанам, якія загінулі ў грамадз. вайну. Тарфяная доследная станцыя «Дукора». Сярэдняя школа, нач. школа, 2 клубы, б-ка, краязнаўчы музей іры СШ, бальніца, антэка, сталовая, 7 магазінаў. 2 помнікі: воінам і на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. У в. Дукарка (злілася з Дукорай) нарадзіўся А. Р. *Чарняхоў*.

ДУКОРСКІЯ ПАРТЫЗАНЫ, удзельнікі барацьбы супраць польскіх акупантаў на тэр. Ігуменскага і Мінскага пав. у 1919—20. У кастр. 1919—красн. 1920 пад кіраўніцтвам Мінскага падпольнага парт. к-та ў Дукорскай, Пярэжырскай, Самахвалавіцкай, Сенніцкай і інш. валасцях створаны партыз. групы і атрады (каля 600 чал.). На чале іх сталі А. А. *Блажко*, С. Р. Камлюк, Г. Ф. Катлянік, А. А. Крывашчокі і інш. Д. п. вялі агіт. работу сярод сялян, псавалі лініі сувязі, рабілі дыверсіі, выконвалі заданні камандавання Чырв. Арміі. Падпольны к-т сіламі партызанаў і падпольшчыкаў рыхтаваў у маі 1920 адначасова ўдар па ворагу ў некалькіх месцах. Але дэфензіва напала на іх след і 27—28 красн. правяла арышты ў в. Козырава, Калядзічы і Гатава, а ў ноч на 3 мая—у в. Дукора і Харавічы. Адбыліся арышты ў в. Забалацце, Кайкава, Лотніца, Міханавічы і інш. Частку арыштаваных акупанты адправілі ў Мінск, астатніх у маёнтак Дукора, дзе знаходзіўся штаб карнікаў. Пасля катаванняў паводле прыгавору ваен.-палявога суда раніцай 17.5.1920 ва ўрочышчы Пушча (каля в. Дукора) расстраляны 11 Д. п.: А. К. Ахрамовіч, А. А. Блажко, П. К. Буры, І. І. Камлюк, І. Р. Камлюк, С. Р. Камлюк, Г. Ф. Катлянік, А. А. Крывашчокі, М. Ф. Маліноўскі, П. С. Пазняк, М. І. Рудовіч. 30 партызанаў асланы ў польскія турмы на тэрміны ад 1 да 10 гадоў, дзе 5 з іх загінулі. Пасля вызвалення Беларусі ад польскіх акупантаў астанкі А. А. Блажко перанесены ў в. Харавічы, астатніх партызанаў—у в. Пярэжыр, дзе ў маі 1923 пастаўлены помнік. У ліп. 1925 помнік пастаўлены і на месцы расстрэлу Д. п. (адноўлены ў 1959). Імёны 16 партызанаў, якія расстраляны і загінулі ў польскіх турмах, названы каля гас у в. Дукора і торфабрыкеты з-д на ст. Седча Пухавіцкага р-на. Д. п. прысвечаны п'еса В. С. Гарбацэвіча «Чырвоныя кветкі Беларусі» і твор паэтаў бел. паэтаў.

У. У. Грамовіч, Мінск.

ДУЛАЎ Атэіст Васілевіч (н. 21.10.1924, Ленінград), беларускі савецкі юрыст. Д-р юрыд. н. (1964). З рабочых. Чл. КПСС з 1946. Скончыў Усесаюзны завочны юрыд. ін-т (1949). З 1944 следчы пракуратуры Ленінграда. У 1954—58 выкладчык Ленінградскага ун-та. З 1958 дацэнт, з 1966 праф. кафедры крымін. працэсу і крымналістыкі юрыд. ф-та ВДУ імя Леніна. Даследуе праблемы тэорыі суддоказаў і метадалогіі крымналістыкі, суд. псіхалогіі, суд. экспертыз, навук. арг-цыі дзейнасці следчых органаў. Узнагароджаны ордэнам Айч. Вайны 2-й ступені, медалямі.

Тв.: Вопросы теории судебной экспертизы в советском уголовном процессе, Мн., 1959; Права и обязанности участников судебной экспертизы, Мн., 1962; Введение в судебную психологию, М., 1970; Судебная психология, Мн., 1970.



ДУЛЕВА Антон Мікалаевіч (н. 14.1.1920, хутар Дулебчычына Ігуменскага пав. Мінскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Чл. КПСС з 1943. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1954). На фронце з жн. 1942. Вызначыўся 20.1.1945. Эскадрон на чале з Д. з ходу фарсіраваў Одэр, заняў с. Прытач і 2 дні адбіваў варожыя контратакі. 30.1.1945, калі эскадрон траціў у акружэнні, Д. арганізаваў прарыў і выратаваў яго. Служыць у Сав. Арміі.

ДУЛЕБКА (Дулеба), рака, левы прыток Ольсы (бас. Бярэзіны). Даўж. 23 *км*. Цячэ ў Вялыніцкім, Бярэзінскім і Клічаўскім р-нах Магілёўскай і Мінскай абл. Вадазбор (152 *км*²) у межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Паверхня плоска-хвалістая. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,9 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца іры меліярацыі.

ДУЛЕБЫ, усходнеславянскае аб'яднанне плямёнаў, якія ў 6—9 ст. жылі на тэр. Валыні.

Арабскі географ аль-Масудзі дае звесткі пра «дарОў» Д.— Вандж-Слава і Маджака. У 1-й пал. 7 ст. Д. вялі настойлівую барацьбу з аварамі, у пач. 10 ст. удзельнічалі ў паходзе кн. Алега на Царград. Пасля распаду аб'яднання пад назвай *бужан* і *валынян* увайшлі ў склад Кіеўскай Русі. Частка Д., на думку А. А. Шахматава, у канцы 8—пач. 9 ст. перасялілася на Пд сучаснай тэр. Беларусі. Гатым ён тлумачыў назвяранне на Беларусі геагр. назваў, якія знаходзяць ад слова «дулебы».

Літ.: Третьяков П. Н. Восточнославянские племена, 2 изд., М., 1953; Шахматов А. А. Древнейшие судьбы русского племени, Петроград, 1919; Греков Б. Д. Киевская Русь, [М.], 1953, с. 455; Пидерле Л. Славянские древности, пер. с чеш., М., 1956, с. 156—157. *Г. В. Штыхаў*. Мінск.

ДУЛІНА, вёска ў Шаркоўшчынскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 11 *км* на Пд ад Шаркоўшчыны, 208 *км* ад Віцебска. 144 ж., гасп. 54 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі.

ДУЛЯЦЦЫ, вёска ў Рэпялёўскім с/с Вашкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя XXII з'езду КПСС. За 36 *км* на ПнЗ ад Вашкавыска, 105 *км* ад Гродна, 12 *км* ад чыг. ст. Рось. 238 ж., гасп. 70 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ДУМЧАЎ Рыгор Ільіч (студзень 1908, в. Пятроўскае Адоеўскага пав. Тульскай губ.— 15.9.1950), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Таганрогскую сан.-парт. школу (1930). У 1930—41 настаўнічаў. У Чырв. Арміі з чэрв. 1941. У партызанах з снеж. 1942—камандзір узвода, атрада; са студз. 1944 камісар *партызанскай брыгады № 33* Магілёўскай вобл. Пасля вайны дырэктар школы ФЗН, дырэктар фабрыкі імя Халтурына ў Вабруйску. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга, медалямі.

ДУМЫ, украінскія народныя ліра-эпічныя песні, пераважна гераічнага характару, пра значныя падзеі з гісторыі Украіны. Выконваюцца нар. спевакамі рачытатывам пад акампанемент кобзы, бандуры або ліры. Блізкія да гістар. песень, але адрозніваюцца ад іх самабытнай формаю. Змястам і формаю нагадваюць *былiны*, але ім не ўласцівы міфічныя вобразы і фантастыка. Апавядаюць пра барацьбу ўкраінскага народа супраць знешніх і ўнутраных ворагаў і ўслаўляюць герояў гэтай барацьбы.

Дзеляцца на гераічныя перылды, у кожным з якіх выказана закончаная думка. Радкі гераічна-складовыя (4—20 складоў), рыфма пераважна дзеслоўная. У песні мелодыя ахоплівае куплет і пасля паўтараецца, а ў Д. яна мяняецца, бо падараджавана сінтакс. складу і рытміцы твора, таму выкананне Д. ў вялікай ступені імправізацыя. Кампазіцыя традыцыйная: запеў (уступ), разгортванне дзеяння з лірычнымі адступленнямі і канцоўка. Паэтыцы Д. уласцівы пастаянныя эпітэты, паралелізмы, разгорнутыя параўнанні, эпічныя паўторы і патрэнні, тауталагічныя зваротЫ і г. д. Вядома каля 50 сюжэтаў Д. (больш за 300 варыянтаў). Найбуйнейшыя адлюстроўваюць напады на Украіну туркаў, крымскіх татар і жахі турэцка-татарскай няволі («Казак Галота», «Маруся Багуслаўка», «Тры браты азоўскія» і інш.). Многа Д. пра вызв. вайну ўкр. і бел. народаў 1648—54 («Хмяльніцкі і Барабаш», «Карсунская нерамога», «Іван Вагун» і інш.). У Д. 18 ст. паказана барацьба супраць шведскіх захопнікаў («Сямён Палій і Мазепа»), у пазнейшых—рэвалюц. змаганне працоўных («Пра Сарочынскія падзеі 1905 года»), барацьба за Сав. ўладу («Дума пра Леніна»), падзеі Айч. вайны («Пра Алега Кашавога»). Упершыню тэрмін «дума» сустракаецца ў польскіх хроніках пад 1500. Да 19 ст. Д. у народзе называліся вялікія эпічныя, пераважна гістар., песні. У пач. 19 ст. укр. фальклярыст М. Максімовіч увёў тэрмін «дума» ў тым значэнні, у якім ён і ужываецца. Самыя славутыя выканаўцы Д.— кабзары А. Верасай, І. І. М. Краўчанкі, Г. Ганчарэнка, Т. Пархомэнка, Ф. Кушнярык, Н. Моўчан і інш. Д. збіралі і выдавалі М. Пяцкалоў, М. Максімовіч, М. Гогаль, І. Сразнеўскі, П. Куліш, В. Антановіч, М. Драгаманаў, І. Манжура, І. Франко, Л. Украінка, Ф. Калеса, М. Рыльскі, А. Вялецкі і інш. Музыку Д. даследавалі М. Лысенка, Ф. Калеса, М. Грынчанка.

Літ.: Колесса Ф. Мелодії українських народних дум, Київ, 1969; Українська народна поетична творчість, т. 1—2, Київ, 1958; Основные проблемы эпоса восточных славян, М., 1958; Кирдан Б. П. Украинские народные думы (XV—начало XVII в.), М., 1962; Ягич И. Украинский народный эпос, М., 1965; Думи, [скл. Г. А. Нудьга], Київ, 1969; Думи, [скл. М. П. Стольмаха], Київ, 1959; Думи, [скл. Г. А. Нудьга], Київ, 1969.

І. У. Саламевіч, Мінск.

ДУНАЕЎСКІ Ісак Восіпавіч [18(30).1.1900, г. Лохвіца Палтаўскай губ.— 25.7.1955], рускі савецкі кампазітар. Нар. арт. РСФСР (1950). Скончыў Харкаўскую кансерваторыю (1919). Працаваў дырыжорам драм. т-раў, кіраваў Ансамблем песні і танца Цэнтр. дома культуры чыгуначнікаў (1938—48). Адзін з пачынальнікаў сав. аперэты («Жанікі», 1927; «Залатая даліна», 1937; «Вольны вецер», 1947, паст. ў Дзярж. т-ры муз. камедыі БССР у 1971; «Белая акацыя», 1955, і інш.), жанру муз. кінакамедыі («Вясёлыя хлопцы», 1934; «Цырк», 1936; «Волга-Волга», 1938; «Кубанскія казакі», 1950, і інш.). Стварыў музыку да бел. фільмаў «Першы ўзвод» (пачатак яго работы ў кіно, 1933), «Шукальнікі шчасця», «Маё каханне», «Двойчы народжаны», «Канцэрт Бетховена», «Данучына спяшаецца на спатканне» і інш. Работа Д. ў галіне масавай песні ў многім вызначыла развіццё гэтага жанру. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1951. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.




Літ.: И. О. Дунаевский. Выступления, статьи, письма. Воспоминания, М., 1961; Чернов А. А.

Исаак Осипович Дунаевский, М., 1961; Михеева Л. В. Исаак Осипович Дунаевский, Л., 1963.

ДУНАЁК, вёска ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл., на р. Грэза. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Кіпячы». За 24 *км* на ПдЗ ад Быхава, 65 *км* ад Магілёва. 337 ж., двароў 75 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 147 воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДУНАЙ (стараж.-грэч. Istros Істр, ням. Donau, венг. Duna, чэш. Dunáj, рум. Dunărea), рака ў Еўропе, другая па даўжыні пасля Волгі. Даўж. 2900 *км*, пл. бас. 817 тыс. *км*². Утвараецца ад зліцця Брэге і Брыгах на ўсх. схілах Шварцвальда, упадае ў Чорнае м. Цячэ па тэр. ФРГ, Аўстрыі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Югаславіі, Балгарыі, Румыніі, СССР.



Панарама Дуная ў Будапешце.

Верхні Д. (да Вены) цячэ ў вузкай глыбокай даліне з высокімі стромкімі схіламі. Шыр. рачышча да г. Ульма 20—100 *м*, да Вены 100—350 *м*, скорасць цячэння 1—2,8 *м/сек*. У сярэднім цячэнні (ад Вены да Жалезных Варотаў) Д. пераскае Сярэднедунайскую нізіну. У асобных горных хрыбтах і градах (Венгерскія Вароты, Вішаградскі праход, Жалезныя Вароты, Казанэ) утварае даліны прарыву. Скорасць цячэння 0,3—1,1 *м/сек*. У ніжнім цячэнні (ад Жалезных Варотаў да вусця) Д. праходзіць па Ніжнедунайскай нізіне, скорасць 0,5—1 *м/сек*. За 80 км ад вусця пачынаецца дэльта (пл. 5640 км²), дзе вылучаюцца 3 гірлы: Кілійскае (на граніцы СССР і Румыніі), Сулінскае і Георгіеўскае. Найб. прытокі: злева — Марава, Ціса, Олт, Сірэт, Прут; справа — Ін, Драва, Сава, Марава. Рэжыму верхняга Д. характэрна летняе разводдзе ад раставання снегу і лёду ў гарах, на астатняй тэр. веснавое разводдзе (май — чэрв.) і летняя межань. На асобных участках у суровыя зімы замярзае да 1,5 *мес*.

Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 6430 *м*³/*сек*, найб. 20 тыс. *м*³/*сек*, найменшы 2 тыс. *м*³/*сек*. Сцёк завісных наносаў 67,5 млн. *т* у год. Водзяцца бялуга, сяўруга, асётр, дунайскі селядзец, сазан, жэрах і інш. Рэгулярнае суднаходства па Д. да Рэгенсбурга (ФРГ). Марскія судны падымаюцца да г. Брэілы (Румынія). Асн. грузапатокі ідуць па сярэднім і ніжнім Д. Саветам Эканамічнай Узаемадапамогі прынята рашэнне аб комплексным выкарыстанні гідрарэсурсаў Д. (запасы 73 млрд. *квт·гадз* у год). Намечана збуд-ва 10 гідравузлоў агульнай магутнасцю 5 млн. *квт*. Будуецца (1970) гідравузел каля Жалезных Варотаў (Румынія, Югаславія) магутнасцю 2,1 млн. *квт*, рыхтуецца буд-ва гідравузлоў Ізмаіл — Тулча (СССР і Румынія) і Ізлаз — Сомавіт (Румынія і Балгарыя). Ствараецца каскад з 14 ГЭС на аўстр. участку (4 ГЭС пабудаваны). Ідзе рэканструкцыя (1970) канала Рэйн — Майн — Дунай. Праектуецца буд-ва канала Одра — Дунай. На Д. найб. гарады: Вена, Браціслава, Будапешт, Бялград, Брэіла, Ізмаіл.

Літ.: Максаковский В. П. Большой Дунай, М., 1963; Залогин Б. С. и Родионов Н. А. Устьевые области рек СССР, М., 1969.

ДУНАЙСКІЯ КНЯСТВЫ, агульная назва княстваў Малдовы і Валахіі (існавалі з 14 ст.). З 1859 аб'ядналіся ў адну дзяржаву Румынію (у 1862 створаны адзіны нац. ўрад).

ДУНДЗІЧ Алека (сапр. Чоліч Мілуцін; 24.1.1893—8.7.1920), герой грамадзянскай вайны ў Расіі. Серб. З 1909 працаваў у Бялградзе, удзельнічаў у рэвалюц. руху. З 1913 у сербскай арміі. У 1916 трапіў у палон да аўстрыйцаў і ўцёк у Расію. У кастр. 1917 з інш. інтэрнацыяналістамі перайшоў на бок Сав. улады. Ваяваў супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў пад Адэсай, Царыцынам, на Украіне. З вер. 1918 камандзір батальёна ў брыгадзе імя 3-га Інтэрнацыянала, камандзір эскадрона ў кав. корпусе С. М. Будзённага, пам. камандзіра палка ў 1-й Конпай арміі. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга. Загінуў у польска-савецкую вайну. Пахаваны ў г. Роўна.

Літ.: Дунаевский А. М. Олеко Дундич, М., 1960.

ДУНІКОЎСКІ (Dunikowski) Ксаверы (24.11.1875, Кракаў — 26.1.1964), польскі скульптар і жывапісец. Праф. з 1904. У 1940—45 вязень Асвенціма. Гал. работы: «Вавельскія галовы» (1925—29, «Пасольская зала» б. Каралеўскага замка ў Кракаве); помнікі Сілезскім паўстанцам на гары Святой Ганны каля Катавіц (1949—52), Вызвалення ў Ольштыне (1949—55), Салдатам 1-й арміі Войска Польскага ў Варшаве (1962—63); партрэты Х. Шчыглінскага (1898), Л. Сольскага (1910—12); жывапісныя цыклы «Асвенцім» (1948—61), «Нябораўскія бабы» (1957—58), «Чалавек у прасторы» (1958).

Літ.: Уразова Л. Ксаверий Дуниковский, М., 1965.

ДУНІЛАВІЧЫ, вёска ў Пастаўскім р-не Віцебскай вобл., на беразе р. Галбеіца. Цэнтр сельсавета і калгаса «Светлы шлях». За 33 км на У ад Паставаў, 233 *км* ад Віцебска, 9 км ад чыг. ст. Варапаева, на скрыжаванні аўтамаб. дарог Паставы — Полацк і Варапаева — Докшыцы. 781 ж., гасп. 246 (1971). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 3 магазіны. У 1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі больш за палову вёскі, расстралялі 829 сав. грамадзян, якім у Д. пастаўлены помнік; помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ Вінцэнты, Вінцук (Вікенцій Іванавіч; псеўд. Навум Прыгаворка; 1807, фальварак Панюшкавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ.— 17.12.1884), беларускі пісьменнік, драматург і тэатр. дзеяч, стваральнік бел. нац. тэатра. Са шляхты. Скончыў Бабруйскую павятовую школу, пасля вучыўся ў Вільні — у агульнаадук. школе, на мед. ф-це Віленскага ун-та. Працаваў чыноўнікам у Мінскай кансісторыі, Мінскай крымінальнай палаце (1831—40). З 1840 жыў у фальварку Люцінка каля Івянца. У кастр. 1864 — снеж. 1865 у Мінскай турме (абвінавачанне: напісанне рэвалюц. пракламацый і ўдзел у паўстанні 1863). Пад наглядам паліцыі з забаронай выезду да 1870. Пісаў на бел. і польскай мовах. Раннія творы — лібрэта да аперэт «Рэкруцкі набор» (паст. 1841, Мінск), «Спаборніцтва музыкаў», «Чарадзейная вада» — не збераглісн. Першы друк. твор — «Сельская ідылія. Опера ў двух актах» на бел. і польскай мовах (1846, Вільня, паст. ў Мінску 1852, гл. *Дуніна-Марцінкевіча тэатр*). Першыя друкаваныя паэт. творы «Вечарніцы і Заварожаны», «Гапон, беларуская аповесць, з праўдзівага здарэння на мове беларускага народа напісаная» (Мінск, 1855). Першая бел. п'еса Д.-М.— фарс-вадэвіль «Пінская шляхта» (пап. 1866). Большасць бел. твораў Д.-М. надрук. ў савецкі час (п'есы «Пінская шляхта», 1918; «Залёты», 1918, паст. 1915, муз. М. Кімонт; вершаваныя аповесці «Травіца брат-сястрыца», 1945; «Быліцы. Расказы Навума», «Халімон на каранацыі», 1946). Частку твораў Д.-М. адшукаць не ўдалося (п'есы «Розная бывае міласць», 1860, і інш.). Асн. творы на польскай мове ў кн. «Цікавішся? — Прачытай!» (Мінск, 1856), «Дудар беларускі, або Усяго патроху» (Мінск, 1857), «Люцінка, або Шведы ў Літве» (Вільня, 1861). Першы перакладчык на бел. мову «Папа Тадэвуша» А. Міцкевіча (Вільня, 1859). Паводле светапогляду быў блізкі да шляхецкіх рэвалюцыянераў: выступаў супраць царызму, падзяляючы тэорыі класавага міру і маральнага самаўдасканалення. Гэта вяло мастака да ідэалізацыі пана, спараджала утапічныя сентымент. карціны ўзаемаадносін паноў і мужыкоў. Аднак блізкасць да нар. пізоў, добрае веданне мовы, псіхалогіі, побыту, нораваў і фальклору бел. сялянства абумовілі нац. каларыт і крытычныя тэндэнцыі, рэаліст. карціны і вобразы паэм «Гапон», «Халімон на каранацыі», п'есы «Пінская шляхта», праніклівы аналіз сац. адносін пасляпяформеннага жыцця ў п'есе «Залёты». Роля Д.-М. ў гісторыі новай бел. л-ры вызначаецца не толькі ідэйна-эстэт. вартасцю яго твораў. Д.-М.. першы з плеяды т. зв. бел.-польскіх пісьменнікаў 1-й пал. 19 ст., які свядома прысвяціў сваю творчасць бел. народу, назваўшы сябе беларускім дударом. У 40—50-я г. быў у цэнтры бел. літ.-грамадскага руху, узначальваў яго. У канцы 19 — пач. 20 ст. на творчасць Д.-М. апіраліся Ф. Багушэвіч і Я. Лучына, Я. Купала і Я. Колас, яго творы пачалі шырока перавыдавацца. Роля і значэнне Д.-М. як першага бел. прафесійнага пісьменніка, шчырага друга народа, арыгінальнага мысліцеля і мастака раскрыта бел. сав. даследчыкамі. Яго п'еса «Пінская шляхта» ўвайшла ў залаты фонд бел. нац. рэпертуару.






Гурток В. І. Дуніна-Марцінкевіча. Злева направа ў першым радзе: Канстанцін Рагоўскі, Рамуальд Рагоўскі, Вінцэнты Дунін-Марцінкевіч, Каміла Марцінкевіч, Фларыян Чапялінскі, Маліноўскі, Вітольд Парафяновіч, Гаўрыла Есьман, Антон Даравінскі (прозвішча апошняга справа ў першым радзе невядомае); у другім радзе: Бітаў, Шаркоўскі, Цітус Свідэрскі, Станевіч, Гаўрыла Война, Мікалай Парафяновіч, Гедрановіч, Аўрэлій Варскі, Міхайлоўскі.

Тв.: Выбр. тв., Мн., 1957; Збор тв., Мн., 1958; Пінская шляхта, Мн., 1968.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 2, Мн., 1969; Майхровіч С., В. І. Дунін-Марцінкевіч, Мн., 1955; Навуменка І. Я. Пісьменнікі-дэмакраты, Мн., 1967; Кісялёў Г. Сейбіты вечнага, Мн., 1963; Семяновіч А. А. Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд), Мн., 1961; Мальдзіс А. Творчае пабрацімства, Мн., 1966; Александровіч С. Старонкі братняй дружбы, Мн., 1960; яго ж. Незабыўнымі сцежкамі, 2 выд., Мн., 1962; Ларчанка М. Р. Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX ст., Мн., 1958; Саннікаў А. К. Сатырычныя характары беларускіх

камедый, Мн., 1961, с. 30—45; Няфёд У. Беларускі тэатр. Мн., 1959; Паулоіч А. «Сялянка» В. Дуніна-Марцінкевіча на мінскай сцэне, «Полымя», 1929, № 8—9; Грабчыкаў С. Слоўнік мовы В. Дуніна-Марцінкевіча, там жа, 1965, № 10; Баршчэўскі Г. Из истории семьи В. И. Дунина-Марцинкевича, «Неман», 1961, № 1; Gołąbek J. Wincenty Dunin-Marcinkiewicz — poeta polsko-białoruski, Wilno, 1932. *А. А. Лойка.* Мінск.

ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА ТЭАТР, беларускі тэатр. калектыў, створаны ў 50-я г. 19 ст. В. *Дуніным-Марцінкевічам*. Т-р выступаў пераважна ў фальварку пісьменніка Люцінка (каля Івянца). У трупу ўваходзілі сам пісьменнік (меў добры камедыйны талент; спрод



Будынак па Саборнай пл. (пл. Свабоды) у Мінску, дзе ў 1852 упершыню паставілена «Сялянка» В. Дуніна-Марцінкевіча.

ролляў — Навум Прыгаворка ў «Сельскай ідыліі»), яго дочкі Каміла (гл. *Марцінкевіч* К.), Мальвіна і сын Міраслаў, а таксама вучні яго школы, суседзі, знаёмыя і сяляне. Выступленні прымяркоўваліся да святаў і ўрачыстых дзён, для гэтага пісьменнік спецыяльна пісаў новую камедыю (большасць не збераглася). У спектаклях часта ўжываліся тры мовы — бел., рус. і польская. 9.2.1852 т-р у Мінску паставіў першую бел. оперу «Сельская ідылія» (пад назвай «Сялянка», лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча, муз. С. Манюшкі, К. Кжыжаноўскага, маст. А. Шэмеш; паўторныя пастаноўкі: у Мінску ў 1853 і 1855, у Глуску ў 1852). Т-р абуджаў нац. самасвядомасць, быў цэнтрам дэмакр. культуры, залажыў асновы прафес. тэатр. мастацтва.

Літ.: Гл. пры арт. *Дунін-Марцінкевіч* В.

А. К. Саннікаў. Мінск.

ДУНІТ (ад назвы г. Дан у Новай Зеландыі), ультраасноўная магматычная горная парода аярыстай структуры, амаль поўнасцю (да 97%) складзеная з *алівіну*, з прымессю храміту, магнетыту і інш. Колер пераважна цёмна-зялёны, амаль чорны, радзей жаўтавата-зялёны. Звычайна Д. у розных ступені зменены і часта цалкам ператвораны ў *серпенцініт*. Утварае вял. масівы, штокі. З Д. звязаны радовішчы храміту, платыны, нікелю, азбесту, тальку (у СССР — Урал, Прыбайкалле і інш.).

ДУПЧАЎ Мікалай Васілевіч (25.2.1919, с. Сергіеўскае Краснаярскага нав. Тульскай губ.— 25.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1943. Вызначыўся ў баях за ст. Обаль, в. Захараўку Віцебскай вобл. 25.6.1944 у час разведкі знішчыў самаходную гармату. Загінуў у баі.

ДУПЕЛЬ (Capella media), птушка сям. слуповых падсям. бакасавых атр. сеўцападобных. Пашыраны ў Еўропе і Азіі.



Даўж. Д. да 35 *см*, маса каля 200 *г*. Аперанне стракатае, рыжавата-бурае. Падобны на бакаса, адрозніваецца буравата-чорнай папярочнай рабізной і карацейшай дзюбай (да 7,4 *см*). Пералётная птушка. Зімуе ў Паўд. Афрыцы і Паўд. Азіі. На Беларусі (нар. назва дубельт) гняздуецца ва ўсіх раёнах. Жыве на балотах і валіўных лугах. Нясе 4 стракатыя яйцы. Корміцца глебавымі беспазваночнымі і карэньчыкамі балотных раслін. Аб'ект спарт. паляванні.

Літ.: Гл. пры арт. *Сеўцападобныя*.

ДУПЛЕКС-ПРАЦЭС (у металургіі; ад лац. duplex падвойны), працэс вытворчасці сталі, які ажыццяўляецца паслядоўна ў двух розных сталеплавільных агрэгатах; працэс плаўлення чыгуну, які спачатку праводзяць у ваграпцы, а потым у эл. печы.

У сталеплавільнай вытворчасці ўжываюцца схемы Д.-п.: мартэнаўская печ — дугавая эл. печ; канвертар — мартэнаўская печ; канвертар — дугавая эл. печ і інш. Д.-п. дае магчымасць выкарыстаць перавагі кожнага сталеплавільнага агрэгата паасобку.

Літ.: Ладыженский Б. Н. Металлургические возможности дуплекс-процесса, М., 1956.

ДУПЛІКАЦЫЯ, паўтарэнне ўчастка храмасомы, у выніку чаго храмасома мае адпаловыя ўчасткі, якія нясуць адпаловыя гены; адзін з тыпаў храмасомных мутацый.

Узнікае пад уплывам унутр. прычын ці ад дзеяння мутагенных фактараў (гл. *Мутагенез*). Вядзе да змены прыкмет, іншы раз да гібелі асобіны. Трапляецца ва ўсіх арганізмах. Выяўляецца пры цыталагічным аналізе храмасом. Можа быць першапачатковым матэрыялам для эвалюцыі.

Літ.: Дубинин Н. П. Общая генетика, М., 1970.

ДУРАВА Надзея Андрэеўна (1783, г. Елабуга Вяцкай губ.— 21.3.1866), першая ў Расіі жанчына-афіцэр, удзельніца Айч. вайны 1812. З сям'і афіцэра. У 1806, пераапрануўшыся ў мужчынскае адзенне, выдала сябе за памешчыцкага сына А. Дурава, далучылася да казацкага палка. Удзельнічала ў войнах Расіі з Францыяй у 1806—07 і 1812—14. За храбрасць узнаг. Георгіеўскім крыжам. З канца 1812 ардынарац у М. І. Кутузава, з 1816 у адстаўцы. Правобраз гераіні многіх маст. твораў, у т. л. оперы А. Багатырова «Надзея Дурава», гераічнай камедыі П. Гладкова «Даўным-даўно», на аснове якой створаны кінафільм «Гусарская балада».

Тв.: Год жизни в Петербурге, СПб., 1838; Записки Александровой (Дуровой). Добавление к девице-кавалеристу, М., 1839; Гудишки, ч. 1—4, СПб., 1839.

Літ.: Белинский В. Г. Записки Александровой (Дуровой). Полн. собр. соч., т. 3, М., 1953, с. 148—157; Мордовцев Д. Русские женщины нового времени, [т. 3], СПб., 1874; Сакс А. Кавалерист-девица-штабс-ротмистр А. А. Александров (Н. А. Дурова), СПб., 1912. *Л. І. Карнейчык.* Мінск.

ДУРАВІЧЫ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Ліпа (1,5 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса «Дубавіцкі». За

12 *км* на У ад Буда-Кашалёва, 40 *км* ад Гомеля, 7 *км* ад чыг. ст. Радзеева. 874 ж., гасп. 218 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, швейная майстэрня, 2 магазіны. Помнік і мемарыяльная дошка на брацкай магіле 200 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДУРАВЫ, сям'я рускіх цыркавых артыстаў-клоунаў і дрэсіроўшчыкаў.

Анатоль Леанідавіч [24.11(6.12).1865, Масква — 8(21).1.1916]. Артыстычную дзейнасць пачаў як клоун, з 1880 працаваў у цырках Цверы, Масквы, Варонежа, Ніжняга Ноўгарада і інш. Гастраляваў па Еўропе. У 1915 выступаў у Мінску. Стварыў сатырычна-публіцыст. клаунаду з дрэсіраванымі жывёлами.

Уладзімір Леанідавіч [24.6(6.7).1863, Масква — 3.8.1934]. Засл. арт. Рэспублікі (1927). Брат А. Л. Дурава. На арэне з 1885. Выступаў як клоун-сатырык і дрэсіроўшчык. Распрацаваў навук. метад дрэсіроўкі, заснаваны на вывучэнні безумоўных рэфлексаў і выпрацоўцы ўмоўных, на гуманных адносінах да жывёл. У 1912 стварыў у Маскве куток-музей (Куток імя У. Дурава).



У. Р. Дураў.

Уладзімір Рыгоравіч [п. 3(16).4.1909, Варонеж]. Нар. арт. СССР (1967). Унук А. Л. Дурава. У выступленнях спалучаў сатыр. клаунаду з паказам дрэсіраваных жывёл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

Юрый Уладзіміравіч [30. 12. 1909 (12. 1. 1910), Масква — 22.2.1971]. Нар. арт. СССР (1971). Чл. КПСС з 1947. Унук У. Л. Дурава. З 1937 у цырку. Выступаў в вялікай групай розных жывёл, спалучаў дрэсіроўку з сатыр. нумарамі. Няраз выступаў у Мінску. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Тв.: Дуров А. Л. В жизни и на арене, Воронеж, 1914; Дуров В. Л. Мои звери, М., 1929; Дуров В. Мои артисты, Киев, 1953.

Літ.: Кузнецов Е. Цирк, М.— Л., 1931; Дмитриев Ю. Братья Дуровы, М.— Л., 1945; его ж. Советский цирк, М., 1963; Таланов А. В. Братья Дуровы, М., 1971.

ДУРАЛЮМІН, дзюраль (ад лац. durus цвёрды + *алюміній*), сплаў алюмінію з медзю, магніем, марганцам, крэмніем і некат. інш. элементамі, агульная колькасць якіх у сплаве не перавышае 6—8%. Найважнейшая асаблівасць Д.— здольнасць станавіцца больш трывалым пры старэнні пасля загартоўкі. Удзельная вага Д. амаль такая, як і алюмінію, а трываласць пры расцяжэнні і цвёрдасць (пасля поўнай тэрмаапрацоўкі і дадатковай халоднай апрацоўкі ціскам) такія, як мяккай сталі [$\sigma_в$=540—590 *Мн/м²* (55—60 *кгс/мм²*), НВ=1270 *Мн/м²* (130 *кгс/мм²*)]. Таму Д. як канструкцыйны матэрыял ужываецца пераважна ў авіябудаванні.

Літ.: Материалы в машиностроении. Справочник, т. 1, М., 1967.

ДУРБАН, Порт-Наталь (Durban, Port Natal), горад на У Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ў правінцыі Наталь. Порт на ўзбярэжжы Індыйскага ак. Чыг. вузел, аэрапорт. 682 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1963). Вываз вугалю, марганцавай руды, храмітаў, цукру, воўны. Харчовая (пераважна цукровая), аўтазборачная, нафтаперапр., хім., дрэваапр. прамысловасць. Бункерная станцыя, база кітабойнага промыслу. Ун-т.

ДУРНАП'ЯН (Datura), род аднагадовых травяністых раслін сям. паслёнавых. Вядома каля 20 відаў, пашыраных пераважна ў тропіках. У СССР 2 віды, на Беларусі адзін — Д. звычайны (D. stramonium).

Сцябло відэльца-галінастае, выш. да 1,2 *м*; лісце яйцападобнае, чараночае, па краі буйназубчастае; кветкі лейкападобныя, белыя, з моцным пахам; плод — чатырохстворкавая каробачка з тоўстымі і цвёрдымі шыпамі. Цвіце з ліп. да восені. Расце на сметніках, дварах і агародах. Мае алкалоіды атрапін, гіясцыямін, скапаламін. Выкарыстоўваецца як лекавая расліна. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Ядавітыя расліны*.

ДУРНІЦЫ, тое, што *булкі*.

ДУРНІЧНІК (Xanthium), род аднагадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Вядома каля 10 відаў, пашыраных у Паўн. і Сярэдняй Амерыцы (у Еўропе і Азіі запосныя як пуставелле). У СССР 6 відаў, на Беларусі 2: Д. калючы (X. spinosum, нар. назва чортаў бур'ян) і Д. звычайны (X. strimarium).

Сцябло раслін галінастае, выш. да 1,5 *м*. Лісце цэласнае, зубчастае або лопасцевае. Кветкі аднаполыя, дробныя, сабраныя ў кошыкі. Плод — учэпістая сямянка. Растуць на сметніках, каля платоў, уздоўж дарог. Ядавітыя расліны, багатыя на ёд, алкалоіды. Насенне мае тлусты алей. Меданосы. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Ядавітыя расліны*.

ДУСАЕЎШЧЫНА, вёска ў Капыльскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр племяннога з-да імя Дзяржынскага. За 8 *км* на ПнУ ад Капыля, 120 *км* ад Мінска, 19 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 632 ж., гасп. 199 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. і вет. пункты, адда. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 68 мірных жыхароў; на іх магіле помнік і мемарыяльная дошка.

ДУТАЎ Аляксандр Ільіч (1864—6.2.1921), адзін з кіраўнікоў казацкай контррэвалюцыі на Урале ў грамадз. вайну. У ліст. 1917 узначаліў антысав. мяцеж. Стварыў у Аранбурзе вайсковы ўрад. У 1918—19 камандаваў Аранбургскай асобнай казацкай арміяй у войску Калчака, пасля разгрому якога збег у Кітай.

ДУ ФУ (другое імя Цзымэй; 712, пачат Гун — 770), кітайскі паэт часоў Танскай дынастыі. З сям'і чыноўніка. У творах паказваў сац. кантрасты феад. грамадства («Вершы з 500 слоў пра тое, што ў мяне было на душы, калі я ехаў з сталіцы ў Фынсянь» і інш.), цяжкі лёс нар. мас, асуджаў грабежніцкія войны. Найб. вядомыя цыклы вершаў «Тры аканомы» і «Тры расстанні». Майстар пейзажнай лірыкі. На бел. мову творы Ду Фу пераклаў У. Дубоўка.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Дубоўка У. Выбр. тв., т. 1, Мн., 1965; рус. пер.— Стихотворения, М.— Л., 1962; Лирика, Л., 1967.

Літ.: Серебряков Е. А. Ду Фу, М., 1958.

ДУХ, тэрмін, які ў дыялектыка-матэрыялістычнай філасофіі выкарыстоўваецца ў значэнні, тоесным *ідэальнаму, свядомасці*, у вузкім сэнсе — *мысленню*. Матэрыялістычная філасофія выходзіць з таго, што матэрыя першасная, а Д., свядомасць другасныя. Духоўнае — функцыя высокаарганізаванай матэрыі, вынік матэрыяльнай, грамадска-гістар. практыкі людзей, сукупнасць сканцэнтраваных у адзінай індывідуальнасці ўсіх функцый свядомасці як вышэйшага прадукту дзейнасці чалавечага мозгу. Духоўнае жыццё грамадства — грамадская свядомасць — выступае як адлюстраванне грамадскага быцця і адначасова актыўна ўздзейнічае на гэтае быццё, на практ. дзейнасць чалавецтва.

Паводле першабытных уяўленняў (гл. *Анімізм*) свет населены добрымі і злымі Д.— нябачнымі, «паветранымі» істотамі. У сучасных рэлігіях Д.— надпрыродная нематэрыяльная сутнасць, усемагутная сіла, бог. Ідэаліст. філасофія, абсалютызуючы творчы бок свядомасці, разглядае Д. як незалежную ад матэрыі аснову, лічыць яго першасным у адносінах да прыроды, крыніцай і рухальнай сілай з'яў рачаіснасці.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Немецкая идеология, Соч., т. 3; Энгельс Ф. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Полн. собр. соч., т. 29). *Ю. А. Харын.* Мінск.

ДУХАВЕНСТВА, служкі культу ў розных рэлігіях (хрысціянстве, будызме, ісламе, іудаізме і інш.), якія складаюць асобныя іерархічныя карпарацыі. Абвяшчаюцца царквой «духоўнымі бацькамі» і пастаўнікамі верующых, быццам бы надзеленымі надпрыроднай сілай, свяшчэнствам, здольнымі быць пасрэднікамі паміж людзьмі і богам, заручацца яго прыхільнасцю.

Паявілася Д. ў перыяд узнікнення класавага грамадства, калі выдзеліліся асобныя групы людзей (знахары, шаманы, ведзьмары), якія спецыяльна займаліся выкананнем рэліг. культаў. У рабаўладальніцкім грамадстве склалася прывілеяваная праслойка жрацоў (гл. *Жрэцтва*), ад якой сучаснае Д. адрозніваецца пераважна прыналежнасцю да манатэістычных рэлігій. Хрысціянскае Д. як саслоўе сфарміравалася пры феадалізме, вызначаецца складанай іерархіяй. Падзяляецца на нізэйшае, або прыходскае, Д. (псаломшчыкі, дыяканы, свяшчэннікі) і вышэйшае (архірэі ці епіскапы, архіепіскапы, кардыналы, мітрапаліты, а таксама патрыярхі і папы). У антаган. класавым грамадстве Д. ў сваёй большасці служыць інтарэсам эксплуататарскіх класаў, асвячае эксплуат. лад як нязменны, богам дадзены і адцягвае нар. масы ад барацьбы супраць сац. прыгнечання. Разам з тым само Д. ўладае вялікімі матэрыяльнымі сродкамі і з'яўляецца эксплуататарам. У канцы 19 ст. цэрквы і манастыры Расіі мелі калі 6 млн. дзесяцін зямлі. Служкі культу былі самымі вялікімі ўкладчыкамі ў ашчадных касах. Цэнтр каталіцкай царквы *Ватыкан* — найбольшы ў свеце трымальнік акцый (каля 6 млрд. долараў), мае залатыя і валютныя запасы каля 12 млрд. долараў.

Пераважная частка Д. ўсіх рэлігій варожа сустрэла перамогу Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыі, актыўна выступіла супраць Сав. улады. З перамогай сацыялізма ў СССР большасць Д. стала на пазіцыю лаяльных адносін да Сав. улады, аднак яно астаецца носьбітам антынавук. рэліг. ідэалогіі. У Вял. Айч. вайну значная частка Д. Беларусі, як і інш. часова акупаваных тэрыторый, здрадзіла Радзіме, прыслугоўвала фаш. акупантам. Пасля вайны пад уплывам рэвалюц. змен у свеце асобныя прадстаўнікі Д., асабліва ніжэйшага, у бурж. краінах уключыліся ў барацьбу за мір і за сац. прагрэс.

Літ.: Ленин В. И. О религии и церкви. Сб., М., 1966; Документы обличают, Мн., 1964.
Дз. М. Маўяс. Мінск.

ДУХОНІН Мікалай Мікалаевіч [1876—20.11 (3.12).1917], рускі контррэвалюц. дзеяч, геп.-л. З вер. 1917 нач. штаба вярх. галоўнакамандуючага, з 1(14) ліст. в. а. вярх. галоўнакамандуючага ў Магілёве. Адмовіўся прызнаць Сав. ўрад і не выканаў распараджэння СНК аб тэрміновых перагаворах з аўстра-герм. камандаваннем пра перамір'е, за гэта 9(22) ліст. зняты з пасады. Напярэдадні здачы Стаўкі Сав. вярх. камандаванню 19.11(2.12).1917 Д. вызваліў з быхаўскай турмы арганізатараў *карнілаўшчыны* — Карнілава, Дзянікіна, Маркава і інш. Арыштаваны Магілёўскім Саветам і перададзены сав. камандаванню. Дзеянні Д. выклікалі стыхійнае абурэнне салдатаў, якія, нягледзячы на процідзеянне аховы, забілі Д. на Магілёўскім вакзале.

Літ.: Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, 2 изд., Мн., 1968, с. 379—382; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967, гл. 4, § 3.

ДУХОЎНЫЯ ВЁРШЫ, эпічныя і ліра-эпічныя песні рэлігійна-хрысціянскага зместу, якія выконваліся пераважна вандроўнымі жабракамі — «старцамі» і лірнікамі.

Асн. крыніца рус., бел. і укр. Д. в.— старазапаветныя і евангг. легенды, жыцці святых і апокрыфы. Большасць Д. в. складзена царкоўнікамі для прапаганды рэлігіі, ідэй і хрысціянскай маралі. Засвоеныя нар. спевакамі-жабракамі, многія Д. в. ўвабралі пэўныя ўласцівасці фальклору: вобразы, сакавітую мову і паасобныя ідэйныя якасці. Папулярныя сярод лірнікаў былі Д. в. пра беднага Лазара і багатыра, Юр'я хароброга, Міколу-цудатворца, Аляксея — божага чалавека, Цмока і інш.

Літ.: Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 5, Витебск, 1891, с. 287—443; Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, ч. 1, М., 1916, с. 496—531; Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии, т. 1 — Старцы, «Этнографическое обозрение», 1892, кн. 12, № 1, с. 70—106; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967, с. 97—104.
М. Я. Грынблат. Мінск.

ДУХОЎНЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ УСТАНОВЫ, рыхтуюць служак культу.

У дарэвалюц. Расіі існавалі: духоўныя вучылішчы (ніжэйшыя 4-гадовыя навуч. ўстановы), духоўныя семінарыі (6-гадовыя сярэднія навуч. ўстановы), духоўныя акадэміі (вышэйшыя навуч. ўстановы). На Беларусі першыя Д. н. ў. паявіліся ў канцы 16 — пач. 17 ст. (гл. таксама *Езуіцкія калегіі і акадэміі*, *Кальвінісцкія школы*). Усе Д. н. ў. былі закрытыя ці паўзакрытыя, сістэма выхавання і навучання мела дагматычны, схаластычны і кансерватыўны характар. Д. н. ў. ў СССР: духоўныя семінарыі і акадэміі рус. праваслаўнай царквы, семінарыі каталіцкай царквы, акадэмія армяна-апостальскай царквы, медрэсэ мусульм. веравызнання, ешыбот іудзейскага веравызнання, тэалагічныя курсы лютэранскай царквы, біблейскія курсы секты евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Утрымліваюцца на сродкі верующых. *М. К. Кірылаў.* Масква.

ДУША, паняцце, узнікненне якога звязана з анімістычнымі поглядамі першабытных людзей (гл. *Анімізм*).

Паводле рэліг.-ідэаліст. уяўленняў Д.— асобная, незалежная ад цела і процілеглая яму бессмяротная нематэрыяльная сутнасць, вобраз бога ў чалавеку, актыўная аснова і носьбіт усяго яго псіхічнага жыцця. Матэрыяліст. светапогляд дапускае выкарыстанне тэрміна Д. ў сэнсе ўнутрана суб'ектыўнага свету чалавека, сукупнасці яго маральных, інтэлектуальных, эмацыянальных, валявых, эстэтычных і інш. псіхічных якасцей (гл. *Псіхіка*). І. П. Паўлаў у вучэнні пра вышэйшую нервовую дзейнасць даказаў, што псіхічныя, або душэўныя, з'явы ўзнікаюць у працэсе рэфлекторнай, адлюстравальнай работы мозгу. Духоўны свет чалавека, яго псіхіка як сістэма актыўнай дзейнасці фарміруецца пад уплывам вонкавага (перш-наперш сацыяльнага) асяроддзя.

Літ.: Гл. пры арт. *Псіхіка*. *Ю. А. Харын.* Мінск.

ДУШАВА, вёска ў Пацейкаўскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Пралетарый». За 10 *км* на З ад Капыля, 135 *км* ад Мінска, 19 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 389 ж., двароў 120 (1971). Млын, лесапільня, швейная майстэрня. Пач. школа, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі. 8.2.1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. карнікі, загубілі 35 мірных жыхароў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

«ДУШАГУБКА», назва спецыяльна абсталяванай аўтамашыны, сканструяванай ням. фашыстамі для масавага знішчэння людзей атрутным газам.

Выраблялiся ў Берліне фірмамі Дыямонд і Заўэр. «Д.» (газенваген) — аўтамашына з крытым ацынкаваным фургонам і герметычнымі дзвярыма. На падлозе драўляных краты маскіравалі адтуліны выхлапных трубаў, праз якія ў фургон ішоў адпрацаваны газ рухавіка. 50—150 чал. памiралі ў «Д.» за некалькі мінут. У Айч. вайну ням.-фаш. захопнікі карысталіся «Д.» для масавага знішчэння насельніцтва на акупаванай тэр., у т. л. на Беларусі.


Літ.: Нюрнбергский процесс, т. 1, 2 изд., М., 1954, с. 831—833; Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, [2 выд.], Мн., 1965, с. 165—174, 237. *А. Г. Вакуевіч.* Мінск.

ДУШАНБЭ (да 1929 Дзюшамбе, да 1961 Сталінабад), сталіца, прамысловы і культ. цэнтр Таджыкскай ССР. Размешчаны ў Гісарскай даліне на выш. 750—930 *м* над узр. м., на р. Душанбінка (ніжняе цячэнне р. Варзоб). Вузел чыгунак і шашэйных дарог, аэрапорт. 374 тыс. ж. (1970). Як горад вядомы з 17 ст. Пазней запяпаў, невялікі кішлак у складзе Бухарскага ханства. У 1922 разбураны басмачамі. Сав. ўлада ўстаноўлена ў 1923. З 1924 сталіца Тадж. АССР (з 1929 Тадж. ССР). У Д. размешчана значная прамысл. вытворчасць рэспублікі. Машынабудаўнічая і металаапр. прамысловасць (з-ды «Таджыктэкстыльмаш», «Душанбесельмаш», «Гандальмаш», бытавых халадзільнікаў, нафт. арматуры, «Таджыккабель» і інш.). Прадпрыемствы вытворчасці буд. матэрыялаў (цэментныя, шферны, дрэваапрацоўчы, домабудаўнічы камбінаты, з-ды жалезабетонных канструкцый). Лёгкая і харч. прамысловасць (тэкст., шаўковы, алейна-тлушчавы, млынавы, мясны, малочны камбінаты; швейная, абутковая, трыкатажная, кандытарская, тытунёвая і інш. ф-кі; гарбарны, вінны, піваварны, хлебны і інш. з-ды). Электраэнергію Д. атрымлівае ад Душанбе-Вахшскай энергасістэмы (Душанбінская ЦЭЦ, Галаўная, Перападная, Цэнтральная і каскад Варзобскіх ГЭС). У 1969/70 навуч. г. ў Д. было 73 агульнаадук. школы ўсіх тыпаў, 112 дашкольных дзіцячых устаноў, 10 сярэдніх спец. навуч. устаноў; 5 ВНУ: *Таджыкскі універсітэт*, пед., мед., с.-г., політэхн. ін-ты. У Д. працуюць (1970): *Акадэмія навук Таджыкскай ССР*, 3 тэатры (драмы імя Лахуці, оперы і балета імя Айні, Рускі драм. тэатр імя Маякоўскага), філармонія, 85 масавых б-к, 50 клубных устаноў, музеі — гісторыка-краязнаўчы і выяўл. мастацтваў імя Бехзада. Гарадская газ. «Вечерний Душанбе». На пач. 1971 у Д. было 25 бальнічных устаноў на 5630 ложкаў (144,3 на 10 тыс. ж.), у т. л. 8 дыспансераў на 0,7 тыс. ложкаў, 59,7 урача на 10 тыс. ж., 143,3 чал. сярэдняга мед. персаналу на 10 тыс. ж. Каля Д.— курорты: Хаджа-Абі-Гарм, Абі-Гарм; санаторый Шаамбары.

Гал. магістраль — праспект Леніна з помнікам У. І. Леніну (1961, скульптары Т. Палякова, А. Рабін). Сярод грамадскіх будынкаў: Дом урада (1940—46, арх. С. Анісімаў), т-р оперы і балета імя Айні (1939—46, арх. А. Юнгер, В. Голі, Дз. Білібін), будынак ЦК КП Таджыкістана (1954—57, арх. Анісімаў), гасцініца «Душанбе» (1961—64, арх. Р. Айзіковіч, В. Шалухін), аэравакзал (1964, арх. У. Афанасьеў). Паводле новага ген. плана ствараецца адзіная сістэма паркаў, бульвараў і штучных вадасховішчаў.

Літ.: Город Душанбе к 50-летию Великой Октябрьской социалистической революции. [Статистический сб.], Душанбе, 1967; Нарзибеков М. Душанбе — столица Таджикистана, Душанбе, 1966.
Д. П. Пулатаў (гаспадарка), *Р. І. Сербул* (культура). Душанбе.

Душанбе. Плошча імя С. Айні.




ДУЭТ (італьян. duetto, ад лац. duo два; муз.), 1) *ансамбль* з двух выканаўцаў. 2) Музычная (пераважна вакальная) п'еса або эпізод у оперы, араторыі, кантаце, аперэце, напісаныя для такога ансамбля.

ДЫАЗАЗЛУЧЭННІ, арганічныя злучэнні, якія змяшчаюць групоўку з двух атамаў азоту (—N=N—), звязаную толькі з адным вуглевадародным радыкалам.

Вядомы Д. аліфатычнага (тлустага) і араматычнага радоў. Пераважна гэта нлўстойлівыя і вельмі рэакцыяздольныя рэчывы. Атрымліваюцца ўзаемадзеяннем араматычных амінаў з азоцістай к-той, рэакцыяй нітрозазлучэння са шчолачамі і інш. Выкарыстоўваюцца для сінтэзу розных арган. злучэнняў; у вытворчасці прамежкавых прадуктаў, фармацэўтычных прэпаратаў, паперы для капіравання чарцяжоў. Рэакцыя араматычных Д. з араматычнымі аміназлучэннямі, феноламі і інш. (азаспалучэнне) ужываецца ў прамысл. вытворчасці азафарбавальнікаў. Стойкія формы Д. выкарыстоўваюцца пры халодным фарбаванні тканін.

ДЫБАЗОЛ, лякарства з сасудараскшыральнымі спазмалітычнымі і гіпатэнзіўнымі ўласцівасцямі. Гл. *Гіпатэнзіўныя сродкі*.

ДЫБЕНКА Павел Яфімавіч (16.2.1889, с. Людкаў Чарнігаўскай губ.— 29.7.1938), савецкі ваенны і дзярж. дзеяч. З сялян. Чл. КПСС з 1912. Скончыў Акадэмію РСЧА (1922). У рэвалюц. руху з 1907. На вайск. службе на Балт. флоце з 1911. За ўдзел у паўстанні на лінкоры «Імператар Павел I» у 1915 зняволены і ў 1916 адпраўлены на фронт. За анты-



ваен. прапаганду арыштаваны, вызвалены пасля Лют. рэв. 1917. Быў чл. Гельсінгфорскага Савета, старшынёй *Цэнтрабалта*. У Кастр. рэвалюцыю чл. Петраградскага ВРК, удзельнік штурму Зімняга палаца. З 26.10 (8.11).1917 да сак. 1918 у складзе першага Сав. ўрада (СНК): чл. калегіі наркамата, нарком па ваен.-марскіх справах. Удзельнік разгрому мяцяжу Керанскага — Краснова. У грамадз. вайну камандаваў злучэннямі Чырв. Арміі на Украіне, у Крыме, пад Царыцынам, на Паўн. Каўказе; нач. зводнай дывізіі пры разгроме краштацкага мяцяжу. У 1925 нач. артыл. ўпраўлення, з 1926 нач. забеспячэння РСЧА. У 1928—38 камандуючы войск Сярэднеазіяцкай, Прыволжскай, Ленінградскай ваен. акруг. Чл. РВС СССР, Дэп. Вярх. Савета СССР 1-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі Чырв. Сцяга.

Тв.: Из недр царского флота к Великому Октябрю, М., 1958; Революционные балтийцы, М., 1959.

Літ.: Балтийские моряки в подготовке и проведении Великой Октябрьской социалистической революции, М.—Л., 1957; Антонов-Овсеенко В. В революции, М., 1957; Юнга Е. С. Путь матроса, М., 1958. *П. А. Селіванаў.* Мінск.

ДЫБОЎСКІ Бенядзікт Іванавіч [29.4(11.5). 1833, маёнтак Адамарын Вілейскага пав. Мінскай губ.— 31.1.1930], заолаг, прыродазнавец і ўрач, прыхільнік і папулярызатар эвалюц. тэорыі Ч. Дарвіна. Чл.-кар. АН СССР (1928). За ўдзел у паўстанні 1863 сасланы ў Сібір. У ссылцы вывучаў Прыбайкалле; з В. Гадлеўскім апісаў фаўну воз. Байкал і яго прыродныя ўмовы. У 1876—84 працаваў урачом на Камчатцы. З 1884 праф. заалогіі Львоўскага ун-та. Навук. працы па біялогіі, сістэматыцы і анатоміі жывёл, антрапалогіі, этнаграфіі. Арганізаваў у Львове музей заалогіі з камчацкіх экспанатаў. Вывучаў бел. азёры Любань, Свіцязь, Чорнае і інш.

Літ.: Лаптев С. Н. Материалы к биографии и научно-исследовательской деятельности В. И. Дыбовского в Восточной Сибири, «Известия Гос. географического об-ва», 1939, т. 71, в. 6; Грицкевич В. П. Путешествия наших земляков, Мн., 1968; Kowalska K. i Miklaszewska-Mroczkowska A. Benedykt Dybowski. Materyały biograficzno-bibliograficzne, cz. 1, Wrocław — Warszawa, 1960. *Г. А. Вінкевіч.* Маглёў; *Г. А. Каханоўскі.* Маладзечна.

ДЫБОЎСКІ Уладзіслаў Іванавіч (18.4.1838, маёнтак Адамарын Мінскага пав.— 27.7.1910), заолаг і палеантолаг, мінералог і батанік. Д-р мінерал. н. (1878). Брат Б. *Дыбоўскага*. Скончыў Мінскую гімназію (1857), Дэрпцкі (Тартускі) ун-т (1862). За ўдзел у паўстанні 1863 засуджаны. З 1871 па кафедры мінералогіі Дэрпцкага ун-та. З 1878 жыў у маёнтку Няпкава на Навагрудчыне. Аўтар прац па флоры і фаўне воз. Байкал (матэрыялы дасылаў з Сібіры брат). Вывучаў флору Навагрудчыны, збіраў бел. фальклор.

ДЫВАН, мастацкі ўзорысты тканы выраб з воўны, шоўку, бавоўны, лёну або з штучных валокнаў, прызначаны на ўпрыгожанне і ўцяпленне жылля. Д. бываюць таксама вышываныя, вязаныя, шытыя са шкур звяроў (у народаў Поўначы); найб. простыя Д.— плоскія цыноўкі і лямец з уваляным, аплікацыйным ці ўшытым узорам. Тканыя Д. падзяляюцца па ворсавыя і бязворсавыя (кілімы, паласы, сумахі, *шпалеры*, габелены). Вырабляюцца ручным спосабам і з сярэдзіны 19 ст. машынным (гл. *Дывanаткацтва*).


Найб. старадаўнія Д. (сярэдзіна 1-га тысячагоддзя да н. э.) знойдзены С. І. Рудэнкам у час раскопак курганоў у даліне Пазырык на Алтаі. Д. былі вядомыя ў Асірыі, Вавілоне; народы, якія займаліся жывёлагадоўляй, абсталёўвалі імі жыллё. Высокія маст. якасці надалі сусв. вядомасць усходнім Д.— персідскім, туэцкім, індыйскім, кітайскім. З даўніх часоў славяцца і туркменскія Д. (тэкінскія, ахал-тэкінскія, салорскія, іамудскія), а каўказскіх — армянскія, азербайджанскія, дагестанскія, грузінскія. Асн. кампазіцыя Д.— цэнтр. поле, аблямаванае шлякам. Арнаментальныя Д. маюць або выдзелены цэнтр (медальён), або арнамент, які рытмічна паўтараецца. Усходнім Д. характэрныя стылізаваныя, пераважна геаметрызаваныя раслінныя матывы, малюнкі чалавечых фігур (персідскія Д.) і жывёл. Сярод захаднееўрапейскіх вылучаюцца франц. Д. мануфактуры Саванеры (засн. 1624) з пышным кветкавым і арабескавым арнаментам. На Украіне і ў Малдавіі пашыраны кілімы са стылізаваным кветкавым узорам (Цэнтр. Украіна) і геам. арнаментам (Зах. Украіна). У Расіі вырабляюцца Д. з узорам з кветак бязворсавыя (Курская і Варонежская вобл.) і высакаворсавыя (Цюменская вобл.). Пасля Кастр. рэв. пачынаецца росквіт дывanаткацтва ў СССР, вядуцца пошукі новых выразных сродкаў, распрацоўваюцца новыя тыпы Д. (тэматычныя і партрэтныя). Паспяхова развіваецца ткацтва Д. у Балгарыі, Румыніі і Польшчы.

На Беларусі Д. вядомыя з даўніх часоў. З-за высокага кошту не былі прадметам пар. хатняга ўбрання; упрыгожвалі звычайна палацы знаці, касцёлы, жыллё багатых гараджан. У шэрагу маёнткаў Мінскай, Магілёўскай, Віленскай і суседніх з Беларуссю Чарнігаўскай (с. Папароўка Старадубскага пав.) губерняў да 50—60-х г. 19 ст. існавалі спец. ткацкія майстэрні дываноў. Беларускія Д. былі бязворсавыя. Асн. іх узоры — стылізаваныя кветкі, лісце, галінкі, якія найчасцей аб'ядноўваліся ў раслінную кампазіцыю з багатым арнамент. цэнтрам. Поле Д. аблямоўвалася шырокім шлякам пераважна з раслінным арнаментам. Тэхніка дывановага ткацтва, перапятая сялянкамі ў 18 ст. ў прыгонных майстэрнях (гл. *Габелен*), захавалася пазней у выглядзе двухбаковых тканін, якія вырабляліся на кроснах. Выкарыстоўваліся Д. як дэкар. посцілкі. Сярод разнастайнага дэкору найб. частыя былі арнамент. кампазіцыі «ў воркі», «у воркі і маланкі», «вясёлка і маланка», «у вянкі», «у кветкі», «у кругі» (ромбы), «у крыжы», «вазоны». Такія Д. пасавалі да традыц. ўбрання хаты. Прамысл. дывanаткацтва ў БССР (ворсавыя Д.) ажыццяўляецца на двух дывановых камбінатах. Вырабам Віцебскага дывановага камбіната найб. характэрны крэмавы фон і залацістая, чырвонабардовая гама малюнка. Найб. цікавыя віцебскія Д.: «30 гадоў БССР», «Беларусь», «Пеўні», «Слуцкі» (мастак В. Сенькіна), «Алені» (Н. Саленнікава), «Зіма», «Ст. Русь», «Свята ўраджаю» (У. Федаровіч), «Беларускі» (М. Дзёміч), «Свята» (І. Шурупаў), «Беларускі» (Т. Гусева) і інш. Найлепшыя ўзоры Д. на Брэсцкім дывановым камбінаце створаны па нар. арнаментальных матывах: «Народны» (В. Сенькіна), «Беларускі», «Свята», «Арнаментальны» (А. Мазуркевіч), «Брэсцкі», «Народны матыў» (У. Гусеў), «Свята ўраджаю» (Т. Сцепанюк). Сярод нар. майстроў дывanаткацтва — Т. Караленка (Гродзенская вобл.). Бел. Д. экспанаваліся на ўсесаюзных і сусв. выстаўках (у Лейпцызе, Познані, Мілане, Джакарце і інш.). Іл. гл. таксама на ўкл.


Літ.: Руденко С. И. Древнейшие в мире художественные ковры и ткани из оледенелых курганов Горного Алтая, М., 1968; Гогель Ф. В. Ковры, М., 1950; Беларускае народнае мастацтва, т. 1, Мн., 1951. *Н. Ю. Бірукова.* Ленінград; *Ф. І. Валабэнка, М. Я. Грынблат.* Мінск.

ДЫВАНАТКАЦТВА, ручное ці машыннае тканне *дываноў* і дывановых вырабаў (*габеленаў*, *шпалераў*, дарожак і інш.). У Д. выкарыстоўваюцца шэрсць, баваўняныя, ільняныя і хім. валокны. Асн. аперацыі: падбор валакністых матэрыялаў, фарбаванне пражы і валакна, тканне і апрацоўка дываноў.

Ручное ткацтва робіцца на верт. або гарыз. варштатах. Выконваецца па нац. узорах або малюнках, вроблених фарбай на спец. паперы ў клетку. Ручныя ворсавыя дываны — шматслойная тканіна палатнянага (міткалевага) перапляцення трох сістэм нітак — асноўнай, уточнай і ворсавай. Каркаснае палатно тканіны робіцца перапляценнем асновы і ўтку; вонкавы слой (малюнак дывана) — каляровымі ворсавымі ніткамі, вузлы якіх шчыльна звязваюцца ў гарыз. (рыс. 1, *а*) або верт. (рыс. 1, *б*) радку па нітках асновы. Бязворсавыя дываны — адпаслойная тканіна, вробленая перапляценнем нітак асновы і розначаляровых нітак утку (рыс. 2). Дываны машыннай вытв. падзяляюцца на бязворсавыя (простай і складанай будовы) і ворсавыя. Дываны простай будовы вырабляюцца з адной сістэмы асновы і адной сістэмы ўтку. Узор вытыкаецца на ткацкім станку з *Жакарда машынай*. Бязворсавыя дываны складанай будовы — гэта двух- або трохслойная тканіна з некалькіх сістэм шарсцяной, баваўнянай ці ільняной асновы і шарсцянога ўтку,




Рыс. 1. Вязка вузлоў (двайных і паўтарачных) у ручным дывanаткацтве: *а* — гарызантальная; *б* — вертыкальная.




Рыс. 2. Схема перапляценняў бязворсавых дываноў: *а* — палас; *б* — кілім.

які стварае ўзор. Найб. вядомыя з такіх дываноў — шатландскія і т. зв. «кідэрмінстэрскія» (нім. і англ.). Ворсавыя дываны вырабляюцца звычайна з асноўным, радзей з уточным ворсам. Паводле спосабу ўтварэння асноўнага ворсу адрозніваюць дываны двухпалотныя з разразным ворсам і т. зв. прутковыя (аднапалотныя). Двухпалотную шматслойную тканіну фармуюць на двухпалотным станку (рыс. 3)



Рыс. 3. Двухпалотны станок з машынаю Жакарда.

ніткамі карэннай насцільнай і ворсавай асноў і ўтку. Потым ніжнія і верхнія палотны, злучаныя ворсавымі петлямі, разразаюць па ворсавых нітках на два дываны (рыс. 4). Прутковыя дываны робяць на аднапалотных станках з жакардавымі машынамі (пры набіўных дыванах — без іх). Гатовыя дываны апрацоўваюць, надаюць ім шаўкавісты бляск, змякчаюць фарбавыя таны ворсавай пражы, ліквідуюць дэфекты тканіны і інш. У БССР дываны вырабляюць *Віцебскі дывановы камбінат* і *Брэсцкі дывановы камбінат*.



Рыс. 4. Структура двухпалотных дываноў: *1* — карэнная аснова; *2* — насцільная аснова; *3* — ворсавая аснова; *4* — ніткі утку; *5* — нож.

Літ.: Механические ковроткацкие станки, М., 1964; Лувишис Л. А. и Афанасьева Т. А. (сост.). Современные методы и приборы для испытания ковровых изделий, М., 1969; Федосенко В. Е. и Уткин А. Г. Ковровое производство, М., 1952. *В. А. Літвінюк.* Брэст.

ДЫВАНОВЫЯ РАСЛІНЫ, расліны, якія выкарыстоўваюцца ў кветкаводстве для афармлення ўзорыстых дывановых клумбаў, кветкавых арнаментаў, рабатак і інш.

Д. р. нізкарослыя (10—15 см), з разнастайным колерам лісця. Размнажаюцца чаранкамі і насеннем у цяпліцах і парніках. У адкрыты грунт высаджваюцца не раней чэрвеня. Асноўныя Д. р.— альтэрнантэры, пірэтрум, бягонія семперфлёранс, лабелія, перыла нанкінская, гнафаліум, санталіна, клейнія, эхеверыя, ірэзіна, цынерарыя марскал. З дзікарослых відаў бел. флоры выкарыстоўваюцца скочкі атожылкавыя, расходнік едкі, агаткі двухдомныя, фестука глаўка.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэкаратыўныя расліны.*

ДЫВЕРГЕНЦЫЯ ў біялогіі (лац. divergentia разыходжанне), разыходжанне прыкмет і ўласцівасцей арганізмаў пад уплывам натуральнага ці штучнага адбору. Тэрмін уведзены Ч. Дарвінам.

Залежыць Д. ад канкрэтных суадносін паміж індывідуальнай зменлівасцю арганізмаў і ўмовамі іх жыцця. Вядзе да стварэння новых сартоў раслін і парод жывёл (пры штучным адборы), да разнастайнасці біял. відаў у прыродзе (пры натуральным адборы). Прынцып Д.— адно з асн. палажэнняў дарвінізму. Процілегласць Д.— *канвергенцыя.*

Літ.: Современные проблемы эволюционной теории, Л., 1967; Шмальгаузен И. И. Проблемы дарвинизма, 2 изд., Л., 1969; Дарвин Ч. Происхождение видов, пер. с англ., М., 1952.

ДЫВЕРГЕНЦЫЯ (у матэматыцы), разыходжанне вектарнага поля, скаляр, які характарызуе прадукцыйнасць крыніцы поля. Ён вызначаецца як граніца адносін патоку праз бясконечна малую паверхню, якая акружае пункт P, да заключанага ўнутры паверхні аб'ёму. Абазначаецца $\mathrm{div}\,\vec{a}$. У каардынатнай форме $\mathrm{div}\,\vec{a} = \frac{\partial a_x}{\partial x} + \frac{\partial a_y}{\partial y} + \frac{\partial a_z}{\partial z}$, дзе a_x, a_y, a_z — кампаненты вектара поля $\vec{a}(P)$. Гл. таксама *Поля тэорыя.*

ДЫВЕРСІЯ (лац. diversio адхіленне, адцягненне), разбурэнні ці пашкоджанні важных аб'ектаў (выбухам, падпальваннем і інш. сродкамі), зробленыя ў мірны або ў ваенны час спец. падрыхтаванымі агентамі ці групамі. У Айч. вайну на Беларусі Д. шырока праводзілі партызаны і падпольшчыкі ў барацьбе супраць пям.-фаш. захопнікаў. Бурж. прапаганда ўжывае ідэалагічныя Д.— фальсіфікацыю фактаў у інтарэсах імперыялістычных дзяржаў.

ДЫВЕРТЫСМЕНТ (франц. divertissement развесяленне), 1) у тэатры — з 17 ст. развесялялыны паказ з танц. і вак. нумароў, камічных сцэнак у дадатак да асн. спектакля; выконваўся паміж актамі ці ў канцы паказу. З 2-й пал. 19 ст. канцэрт у эстрадным т-ры. 2) У балеце — танц. сюіта ці ўстаўныя нумары, непасрэдна з сюжэтам не звязаныя. 3) У музыцы — сюіта развесялялынага характару (тыпу серэнады) для інстр. ансамбля (аркестра) ці лёгкая, віртуозная п'еса тыпу папуры, варыяцый і г. д. часта на зададзеныя тэмы.

ДЫВІДЭНД (ад лац. dividentus тое, што трэба раздзяліць), даход, які перыядычна атрымліваюць удзельнікі *акцыянернага таварыства* на кожную *акцыю.*

Выплачваецца з чыстага прыбытку пасля адлічэнняў у запасны капітал і розныя фонды. Даход на акцыю капіталісты выкарыстоўваюць як прыманку для т. зв. «ўдзелу рабочых у прыбытках», «сумеснага валодання маёмасцю», што з'яўляецца асновай бурж. тэорыі *народнага капіталізму».* Аднак доля даходаў працоўных на акцыі вельмі малая. Найбольшы Д. атрымліваюць уладальнікі асн. масы акцый — буйныя капіталісты, якія, прадаючы акцыі рабочым, імкнуцца падарваць іх актыўнасць у барацьбе супраць прадпрыемцаў, выкарыстоўваюць зберажэнні працоўных для фінансавання манаполій.

Літ.: Империализм и кризис мирового капитализма, 2 изд., М., 1968; Сальковский О. В. Социальная политика буржуазии и пролетариат (по материалам ФРГ), М., 1969.

ДЫВІЗІЁН (франц. division ад лац. divisio падзел), асн. тактычнае і агнявое падраздзяленне артылерыі, у ВМФ — злучэнне адпаведных караблёў.

ДЫВІЗІЯ, асноўнае тактычнае злучэнне ў розных відах узброеных сіл, якое ў залежнасці ад прызначэння ўключае некалькі часцей і падраздзяленняў родаў войск і спец. войск. У Сав. Арміі мотастралковыя, танкавыя, паветрана-дэсантныя і інш.

ДЫВІЗІЯНІЗМ, гл. *Неаімпрэсіянізм.*

ДЫГАСІНСКІ (Dygasiński) Адольф (7.3. 1839, Негаславіцы Келецкага ваяводства — 3.6.1902), польскі пісьменнік і педагог. Удзельнік паўстання 1863. Займаўся пед. і выдавецкай дзейнасцю ў Кракаве і Варшаве. Зазнаў ганенні клерыкальнай рэакцыі. У 1890—91 наведаў Бразілію; цяжкае становішча польскіх эмігрантаў паказаў у «Пісьмах з Бразіліі» (1891) і аповесці «На пагібель» (1893). Творчасць Д. рэалістычная, з натураліст. тэндэнцыямі. Апавяданні («Навелы», кн. 1—3, 1884—85; «З сёлаў, палёў і лясоў», 1887; «З загона і бруку», 1889; «З нашай нівы», 1900) адлюстроўваюць гаротнае жыццё вясковай і гарадской беднаты. У аповесцях і раманах («Гаспадары», 1887; «Бальдонак», 1888; «Скалечанае жыццё», 1897; «Гарэлка», 1894; «Любандзкія драмы», 1896; «Маргеля і Маргелька», 1901) выкрываў грамадскую несправядлівасць. Аўтар твораў пра звяроў (аповесці «Заяц», 1900; «Урачыстасць жыцця», 1902).

Тв.: Pisma wybrane, t. 1—24, Warszawa, 1949—53; рус. пер.— Маргеля и Маргелька. Повести и рассказы, М., 1961. *У. М. Казбарук.* Мінск.

ДЫГЕНЕТЫЧНЫЯ СМАКТУНЫ, клас *плоскіх чарвей.*

ДЫГЕРЫ (англ. digger капальнік), прадстаўнікі крайне левага крыла рэвалюц. дэмакратыі ў англійскай бурж. рэвалюцыі 17 ст. Аддзяліліся ад дробнабурж.-дэмакр. групоўкі *левелераў,* называлі сябе «сапраўднымі левелерамі».

Былі выразнікамі інтарэсаў беднаты, асабліва беззямельных і малаземельных сялян. Выступалі супраць прыватнай уласнасці на зямлю. Д. першыя абвясцілі ідэал калект. уласнасці і калект. працы. Праграма Д. у тагачасных умовах была праграмай радыкальнай ліквідацыі феадалізму. Ідэолаг і кіраўнік Д.— Дж. Уінстэнлі. У 1649 у шэрагу графстваў Д. пачалі супольна апрацоўваць пустальныя землі. Рух Д. задушаны ў 1650 урадавымі войскамі.

Літ.: Барг М. А. К вопросу о социальной идеологии диггеров, «Новая и новейшая история», 1960, № 4; Волгин В. П. Диггеры и Уинстенли, у кн.: Уинстенли Дж. Избранные памфлеты, пер. с англ., М.— Л., 1950.

ДЫДАКТЫКА (ад грэч. didaktikós павучальны), галіна педагогікі, якая распрацоўвае тэорыю *адукацыі* і *навучання.* Змест, формы і метады навучання грунтуюцца на пэўных дыдактычных прынцыпах. Гал. прынцыпы сав. Д.: навуковасць, сувязь навучання з жыццём, выхаваўчае навучанне, сістэматычнасць і паслядоўнасць у навучанні, свядомасць і актыўнасць у навучанні, наглядназць, дастуннасць навучання, трываласць засваення ведаў, індывідуальны падыход да вучня ва ўмовах калект. работы з класам.

Тэрмін Д. стаў пашыраны з 17 ст., калі чэшскі педагог Я. А. Каменскі распрацаваў тэорыю навучання і выхавання дзяцей, прапанаваў і абгрунтаваў новыя прагрэс. дыдактычныя парады (*класна-ўрочная сістэма навучання*; працягласць навуч. года, чвэрці і вучэбнага дня; прынцыпы і правілы навучання і г. д.). У 18 ст. франц. асветнік Ж. Ж. Русо, філосафы-матэрыялісты К. А. Гельвецый, Д. Дзідро крытыкавалі схаластычную сістэму адукацыі. Развіццё Д. ў пач. 19 ст. звязана з імем швейц. педагога І. Г. Песталоці, які распрацаваў тэорыю элементарнай адукацыі, расшырыў рамкі агульнаадук. школы, увёў новыя прадметы, стварыў Д. працоўнага навучання. З канца 19 ст. вылучэнне Д. як тэорыі навучання ў асобную частку ў курсах педагогікі стала агульнапрынятым, выключаючы Англію і ЗША, дзе тэрмін Д. не ўжываецца, а тэорыя навучання распрацоўваецца пераважна ў працах па пед. псіхалогіі. У Расіі дыдактычную сістэму, якая не страціла значэння і для сучаснай Д., стварылі ў 19 ст. вядомы педагог К. Дз. Ушынскі і яго паслядоўнікі. Развіццё Д. па Беларусі звязана з заснаваннем у 16—17 ст. *брацкіх школ.* Пэўны ўклад у развіццё Д. зрабілі бел. асветнікі Ф. Скарына, С. Будны, М. Смятрыцкі і інш. У 1881 бел. вучоны-педагог Е. Р. Раманаў выдаў «Падручнік рускай граматыкі», прызначаны для навучання дзяцей беларусаў. У 1906 выйшаў у свет бел. буквар «Беларускі лемантар» К. Каганца. У 1918 выдадзена «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча. Выдатная роля ў стварэнні падручнікаў на бел. мове належыць бел. пісьменнікам Я. Коласу і Цёткі (А. С. Пашкевіч).

Сав. Д. цесна звязана з *псіхалогіяй* (агульнай, узроставай, педагагічнай), узроставай фізіялогіяй, развіваецца на аснове прагрэс. ідэй і тэорый класічнай Д. Яе метадалагічнай асновай з'яўляецца марксісцка-ленінская тэорыя пазнання. Змест адукацыі ў сав. школе вызначаецца агульнаю мэтаю камуніст. выхавання — падрыхтоўкі ўсебакова развітых будаўнікоў камунізма — і накіроўваецца навуч. планам. У навуч. план школ уключаюцца веды аб прыродзе, грамадстве, асновах вытворчасці, мастацтве і фіз. культуры, якія павінны забяспечыць усебаковае і гарманічнае развіццё вучняў, падрыхтаваць іх да жыцця, да ўдзелу ў вытв. працы, сфарміраваць іх навук. светапогляд. З 1-га класа пачынаецца прац. навучанне дзяцей. У аснову зместу адукацыі ў сав. школе пакладзены політэхнічны прынцып (гл. *Політэхнічная адукацыя*). Аб'ём ведаў, уменняў і навыкаў вызначаюць праграмы, пабудаваныя на навукова дакладным, праверапым практыкаю матэрыяле, які адпавядае мэтам і задачам *выхавання.* Асаблівая ўвага звяртаецца на ажыццяўленне адзінства тэорыі і практыкі, забеспячэнне сістэматычнасці ў навучанні. Канкрэтны матэрыял, прадугледжаны праграмай, выкладаецца ў *падручніках,* якія з'яўляюцца асн. крыніцай ведаў для вучня (гл. таксама *Праграмы навучальныя*). Планы і праграмы сав. школы прыводзяцца ў адпаведнасць з узроўнем развіцця грамадства, навукі, тэхнікі і новымі задачамі, якія паўстаюць перад школай на пэўнай ступені яе развіцця. З 1966 сав. школа пераходзіць на новы змест адукацыі ў сувязі з неабходнасцю прывесці яго ў адпаведнасць з дасягненнямі навукі, ажыццяўленнем у краіне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, скарачэннем тэрмінаў навучання ў пач. школе з 4 да 3 гадоў. Бел. вучоныя-педагогі распрацоўваюць змест адукацыі на бел. мове і л-ры ў школах з бел. і рус. мовамі навучання, па гісторыі БССР, геаграфіі БССР. У рэспубліцы створаны навуч. праграмы, падручнікі і навуч. дапаможнікі па гэтых прадметах. Пэўны ўклад робяць бел. вучоныя-педагогі і ў распрацоўку агульных праблем Д.: пытанняў політэхнічнага і працоўнага навучання, актывізацыі працэсу навучання, удасканалення формаў і метадаў навучання з улікам мясц. умоў і нац. спецыфікі. Н.-д. работа ў галіне тэорыі адукацыі і навучання сканцэнтравана ў НДІ педагогікі Мін-ва асветы БССР, у БДУ, Гомельскім ун-це, пед. ін-тах рэспублікі.

Літ.: Ленін У. І. Задачы саюзаў моладзі. Прамова на III Усерасійскім з'ездзе Расійскага Камуністычнага Саюза Моладзі, Мн., 1969; Крупская Н. К. Народное образование и демократия. Педагогические соч., т. 1, М., 1957; Данилов М. А. и Есипов Б. П. Дидактика, М., 1957 (бібліягр.); Данилов М. А. Процесс обучения в советской школе, М., 1960; Основы дидактики, под ред. Б. П. Есипова, М., 1967; Коменский Я. А. Великая дидактика, Избр. пед. соч., [пер. з лац.], М., 1955; Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі, Мн., 1968.

М. Г. Агурцоў. Мінск.

ДЫДАКТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА, мастацкая літаратура павучальнага зместу. Выкарыстоўвае мастацкую (пераважна вершаваную) форму для выкладу навуковых, філас., маральных, рэліг. ведаў і ідэй.

Узнікла ў Ст. Індыі і ў Кітаі. Узоры Д. л.— «Прытчы» Саламона, «Дні і турботы» Гесіёда, «Георгікі» Вергілія, «Пра сутнасць рэчаў» Лукрэцыя і інш. У сярэднія вякі дыдактычнай была рэліг. л-ра, многія аб. павел, павучальныя аповесці, школьная драма. У л-ру Кіеўскай Русі прыйшла з хрысціянствам. Элементы дыдактыкі ўласцівыя старажытнарус. і старажытнабел. перакладной л-ры (*«Гісторыя пра Варлаама і Іасафа», «Александрыя», «Вялікае зярцала»* і інш.) і арыгінальнай (творы К. Тураўскага, С. Буднага, С. Полацкага і інш., усл палемічная л-ра). У 19 ст. аддзяляецца ад мастацкай. *М. І. Прашковіч.* Мінск.

ДЫЁЗ (ад грэч. diesis паўтон, паазей — чвэрць тона), знак *альтэрацыі* (♯), які паказвае павышэнне гуку на паўтон.

ДЫЁНАВЫ СІНТЭЗ, рэакцыя далучэння *дыенавых вуглевадародаў* са спалучанымі падвойнымі сувязямі да ненасычаных злучэнняў, якія маюць рэакцыяздольную кратную сувязь. Напр., рэакцыяй бутадыену з малеінавым ангідрыдам атрымліваюць тэтрагідрафталевы ангідрыд.


Д. с. ідзе без каталізатара пры награванні (не вышэй за 120 °С). Прадукты — рэчывы з шасцічленным цыклам. З дапамогай Д. с. атрымліваюць поліцыклічныя злучэнні (духмяныя рэчывы, лекавыя прэпараты), а таксама даследуюць вітаміны групы D і інш. складаныя прыродныя злучэнні.

ДЫЁНАВЫЯ ВУГЛЕВАДАРОДЫ (дыены), C_nH_{2n-2}, ненасычаныя вуглевадароды з адкрытым ланцугом і з дзвюма падвойнымі сувязямі.

Адрозніваюць Д. в. з кумуляванымі >C=C=C<, спалучанымі >C–CH=CH–C< і з ізаляванымі >C–CH=CH$_2$—CH–C< падвойнымі сувязямі. Дыены з кумуляванымі і ізаляванымі падвойнымі сувязямі хім. ўласцівасцямі амаль не адрозніваюцца ад алефінаў (гл. *Ненасычаныя вуглевадароды*). Найважнейшыя з Д. в. дыены са спалучанымі сувязямі (напр., *бутадыен, ізапрэн*), яны вельмі рэакцыяздольныя: лёгка палімерызуюцца, далучаюць вытворныя алефінаў (гл. *Дыенавы сінтэз*). Атрымліваюць Д. в. адшчапленнем вадароду ад насычаных вуглевадародаў, дэгідратацыяй гліколяў і інш. спосабамі. Ужываюцца ў вытворчасці сінт. каўчукаў і ў сінтэзе розных арган. рэчываў.

ДЫЭЛЕКТРОДНАЯ ПАЎПРАВАДНІКОВАЯ, двухэлектродная паўправадніковая прылада, заснаваная на нелінейных уласцівасцях электроннадзірачнага пераходу ці кантакту паўправаднік — метал. Шырока выкарыст. ў схемах радыётэхнікі, аўтаматыкі, электронікі і інш.

Існуе шмат класаў Д. п., якія адрозніваюцца жыв сабой выкарыстаннем розных уласцівасцей электронна-дзіркавага пераходу, велічынямі напружанняў, токаў, магутнасцей, дыяпазонамі рабочых частот і г. д. Паводле частотнага дыяпазону Д. п. падзяляюцца на тры групы: 1) звышвысокачастотныя (ЗВЧ) дыёды, выкарыстоўваюцца для генерыравання, узмацнення, змешвання, мадулявання, дэтэктыравання, пераўтварэння частот у ЗВЧ дыяпазоне (напр., ЗВЧ дыёды, параметрычныя, тунельныя, лавіна-пралётныя, дыёды Ганна і інш.); 2) высокачастотныя дыёды, выкарыстоўваюцца ў шырокім дыяпазоне частот (ад нізкіх да звышвысокіх) у схемах дэтэктыравання, выпрамлення, пераўтварэння частоты, у вымяральных схемах і інш.; 3) імпульсныя дыёды, выкарыстоўваюцца для выпрамлення пераменнага току нізкай частоты. Існуюць таксама апорныя дыёды ці крэмніевыя стабілітроны, якія выкарыстоўваюцца для стабілізацыі напружання; дыёды спантаннага і вымушанага выпраменьвання (напаправадніковыя лазеры), якія пераўтвараюць эл. энергію ў светлавую, і інш. Паводле канструкцыйнай Д. п. падзяляюцца на кропкавыя і плоскасныя (гл. рыс.). Кропкавыя вырабляюцца



Рыс. а. Кропкавы паўправадніковы дыёд: *1* — плоскасны паўправаднік; *2* — спружынка-вастрыё; *3* — герметычны металічны корпус; *4* — вывады электродаў. Рыс. б. Плоскасны паўправадніковы дыёд: *1* — крышталь паўправадніка з электроннай праводнасцю; *2* — крышталь паўправадніка з дзіркавай праводнасцю; *3* — герметычны металічны корпус; *4* — вывады электродаў.

з прыпаянным ці кантактным, плоскасныя — металічнай сеткай, дыфузіі дамешак, вырошчання манакрыштальнай паўправадніка з расплаву і інш. Перавагі Д. п. перад дыёдам электравакуумным (гл. *Лямпа электронная*): высокая надзейнасць, пастаянная гатоўнасць да работы, высокі ккд і доўгі час службы. Недахоп — абмежаваны інтэрвал рабочых т-р (прыблізна ад −70 да +125 °С).

Літ.: Федотов Я. А. Основы физики полупроводниковых приборов, М., 1970; Дыкин А. В. Электронные и полупроводниковые приборы, М.—Л., 1965; Лабутин В. К. Полупроводниковые диоды, 2 изд., М., 1967; Горбачев А. И. и Кукарин С. В. Полупроводниковые СВЧ диоды, М., 1968; Бодиловский В. Г. Электровакуумные и полупроводниковые приборы в устройствах автоматики, телемеханики и связи, 2 изд., М., 1969.

І. С. Кавалёў. Мінск.

ДЫЕД ЭЛЕКТРАВАКУУМНЫ, гл. *Лямпа электронная.*

ДЫЗ... гл. *Дыс...*

ДЫЗАЙН (англ. design замысел, праект), *мастацкае канструяванне* прамысл. вырабаў. Тэорыя Д.— *тэхнічная эстэтыка.*

ДЫЗЕЛЬ, цеплавы рухавік, вынайдзены (1892) і пабудаваны (1897) ням. вынаходнікам Р. Дызелем. Гл. *Рухавік унутранага згарання.*

ДЫЗЕЛЬНАЕ ПАЛІВА, сярэднія і цяжкія фракцыі перагонкі нафты, якія выкарыстоўваюцца як паліва для дызеляў.

Для быстраходных рухавікоў ужываюць газа-зойлевую фракцыю прамой перагонкі нафты з сярністай і маласярністай нафты выпрацоўваюць 4 маркі Д. п. (арктычнае, зімовае, летняе і спецыяльнае) для розных тэмпературных і эксплуатацыйных умоў. Для рухавікоў сярэдняй быстраходнасці служыць саляравае масла, а для цяжкіх — больш цяжкія фракцыі і астаткавыя нафтапрадукты. Асн. характарыстыкі Д. п.— цэтанавы лік (ЦЛ), фракц. састаў, вязкасць, каксавальнасць і інш. ЦЛ характарызуе самазагаральнасць Д. п. ў рухавіку і выражаецца колькасцю цэтану (у %) у такой сумесі з α-метылнафталінам, які мае адпаведную загаральнасць з гэтым Д. п. У сучасных Д. п. ЦЛ роўны 40—55, павышаюць яго дабаўленнем *прысадак.*

ДЫЗЕЛЬ-ПОЕЗД, поезд, які прыводзіцца ў рух дызельным рухавіком унутр. згарання, размешчаным у маторным вагоне.

Д.-п. ДР-1 Рыжскага вагонабудаўнічага з-да складаецца з 2 маторных і 2 прычапных вагонаў. Месцаў для сядзення 416. Сілавая ўстаноўка — 2 дызелі магутнасцю па 736 *кВт* (1000 к. с.), якія праз гідраперадачу верцяць вядучыя колы маторных вагонаў. Канструкцыйная скорасць Д.-п. 120 *км/гадз.* Выкарыстоўваюцца для прыгарадных сувязі на неэлектрыфікаваных участках чыгункі. Гл. таксама *Аўтаматрыса.*

ДЫЗЕЛЬ-ЭЛЕКТРАХОД, судна з электрычнымі грабнымі рухавікамі. Гл. *Электраход.*

ДЫЗЕНТЭРЫЙНАЯ АМЕБА (Entamoeba histolytica), паразітычны аднаклетачны арганізм атр. амёбаў падкласа караняножак.

Дыяметр 20—30 *мкм.* Жыве ў сценках тоўстай кішачніка, у печані і інш. органах чалавека. Выклікае *амёбіяз.* У арганізм трапляе ў выглядзе цыстаў (стадый спакою), якія выдзяляюцца хворымі або цыстаносьбітамі (людзьмі, у якіх хвароба не выяўляецца). Трапляецца ўсюды.

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

ДЫЗЕНТЭРЫЯ (*дыс...*+грэч. enteron кішэчнік), крываўка, эпідэмічная хвароба з групы кішачных інфекцый. Да 1917 на Беларусі Д. была адной з найб. пашыраных інфекцыйных хвароб, якая давала вялікую смяротнасць.

Д. ўзнікае ад дызентэрыйных бактэрый Грыгор'ева — Шыгі, Флекснера, Зонэ, Штуцэр — Шмітца, Ларджа — Сакса. Хварэюць на Д. пераважна ўлетку і ўвосень. Крыніца інфекцыі — хворыя на Д. і бактэрыяносьбіты (гл. *Бацыланосьбітства*), якія выдзяляюць узбуджальнікаў з надворкам. Паляранню Д. спрыяюць мухі, парушэнне асабістай гігіены і сан. стану ўстаноў водазабеспячэння і харч. прадпрыемстваў. З харч. прадуктамі і вадой бактэрыі трапляюць у страваварна-кішачны тракт і выклікаюць спецыфічнае запаленне з утварэннем язваў на слізістай абалонцы тоўстага кішэчніка.

Інкубацыйны перыяд 2—3 сутак. Вострая Д. пачынаецца з болю галавы, дрэннага апетыту, схваткападобнага болю ў ніжняй частцы жывата, вадкага і частага падворку. Хранічная Д. перыядычна абвастраецца. Лячэнне: шпіталізацыя, сульфаніламіды, антыбіётыкі, дыэта, рэчывы, якія павышаюць рэактыўнасць арганізма, пры хранічнай Д.— дадаткова вакцынатэрапія. Прафілактыка: актыўнае выяўленне хворых і бактэрыяносьбітаў, асабліва сярод работнікаў водазабеспячэння і харч. прадпрыемстваў; дыспансерны нагляд за асобамі, якія хварэлі на Д.; асабістая гігіена, знішчэнне мух, сан. парадак на тэрыторыях двароў, кіпячэнне пітной вады

з адкрытых вадаёмаў. Людзям, якія былі ў кантакце з хворымі на Д., назначаюць *бактэрыяфаг.*

Л. А. Ключароў. Мінск.

Сярод с.-г. жывёл на Д. хварэюць ягняты (узбуджальнікі — анаэробныя мікраарганізмы групы Clostridium perfringens) і парасяты (узбуджальнік не высветлены). Заражэнне адбываецца праз корм, пітную ваду і подсціл, забруджаныя выдзяленнямі хворых жывёл і бактэрыяносьбітаў. Хвароба суправаджаецца моцным паносам і схудненнем. Найб. страты выклікае сярод 2—4-месячных парасят і пры вострай форме ў ягнят. Прафілактыка і меры барацьбы: захаванне вет.-сан. правілаў утрымання, паўнацэнны корм, абяскоджанне крыніц інфекцыі, засцерагальныя прышчэпкі фармалвакцынай, імунізацыя ягнят.

В. Ф. Патроў. Віцебск.

Літ.: Сиворцов М. А. Дизентерия, у кн.: Многотомное руководство по патологической анатомии, т. 3, М., 1960 (бібліягр.); Бунин К. В. Диагностика инфекционных болезней, М., 1965; Бахтин А. Г. Дизентерия свиней, у кн.: Болезни свиней, Тарту, 1960; Полыковский М. Д. Анаэробная дизентерия ягнят, у кн.: Болезни овец, М., 1963; Здравоохранение Белорусской ССР за сорок лет (1919—1958). Указатель литературы, Мн., 1961, с. 307—322.

ДЫЗ'ЮНКЦЫЯ (ад лац. disjunctio раз'яднанне, адрозненне), аперацыя матэматычнай логікі, якая аб'ядноўвае два або больш выказванняў з дапамогай лагічнай звязкі «або».

Адрозніваюць два віды Д.: нястрогую і строгую. Нястрогую Д. сімвалічна запісваюць: $A \vee B$ (A або B, або тое і другое разам); строгую: $A \veebar B$ (або A, або B, але не абодва разам). Строгая Д. ісціннай толькі тады, калі адно з выказванняў, што ў яе ўваходзяць, ісціннае, а другое няісціннае; нястрогая Д. можа быць ісціннай таксама і ў выпадку, калі ісцінным абодва выказванні, што ў яе ўваходзяць. У табліцы *I* паказвае ісціннасць, *Н* — няісціннасць Д.

A	B	$A \veebar B$	$A \vee B$
I	*I*	*Н*	*I*
I	*Н*	*I*	*I*
Н	*I*	*I*	*I*
Н	*Н*	*Н*	*Н*

Звычайна ў лагічных дэдукцыйна пабудаваных вылічэннях выкарыстоўваецца толькі слабая Д.

Літ.: Гл. пры арт. *Матэматычная логіка.*

ДЫКТАТАР (лац. dictator ад dicto дыктую), 1) асоба, якая кіруе асабіста і мае неабмежаваную ўладу. 2) У Ст. Рыме перыяду Рэспублікі службовая асоба з неабмежаванымі грамадскімі і вайск. паўнамоцтвамі. Прызначаўся консулам паводле рашэння сената ў выключных выпадках (вайна, пар. паўстанне) на 6 месяцаў. У 2—1 ст. да н. э. былі выпадкі бестэрміновай дыктатуры (Карнелій *Сула*, Юлій *Цэзар*). Пры іх пасада Д. набыла манархічны характар. Ліквідавана ў 44 да н. э. Маркам *Антоніем.*

ДЫКТАТУРА (лац. dictatura неабмежаваная ўлада), сістэма паліт. панавання пэўнага грамадскага класа, заснаваная на сіле. У антаган. грамадстве эксплуататарская меншасць з дапамогай Д. захоўвае панаванне над большасцю насельніцтва.

Ёсць розныя тыпы Д. эксплуататарскіх класаў: рабаўладальніцкі, феад.-прыгонніцкі, бурж.-памешчыцкі, буржуазны. Буржуазія адмаўляе належнасць сваёй Д. пры капіталізме, прыкрываючы яе «агульнанацыянальнымі», «дэмакратычнымі» інстытутамі (парламенты, усеагульныя выбары і інш.). Але розныя формы дзяржавы ў капіталіст. краінах (канстытуцыйная манархія ў Вялікабрытаніі, прэзідэнцкая рэспубліка ў Францыі, прэзідэнцкая федэратыўная рэспубліка ў ЗША і інш.) па сваёй прыродзе — Д. буржуазіі. У перыяд абвастрэння класавых супярэчнасцей рэакц. класы імкнуцца ўсталяваць Д. ў найбольш антыдэмакр. форме — контррэвалюцыйныя Д. (Д. Каваньяка ў Францыі ў 1848, фашысцкая Д. ў Германіі (1933—45), Італіі (1922—43), Іспаніі, Партугаліі, дыктатарскія рэжымы ў некат. краінах Лац. Амерыкі). У эпоху імперыялізму і сацыялізм. рэвалюцыйны прыгнечаныя класы ўсталёўваюць сваю Д.— Д. большасці народа над кучкай прыгнятальнікаў. Яна патрэбна, каб задушыць супраціўленне зрынутых класаў і замацаваць заваёвы рэвалюцыі (Д. пралетарыяту ў Расіі, рэвалюцыйна-дэмакратычная Д. ў краінах, якія сталі на шлях некапіталіст. развіцця). У пераходны перыяд ад капіталізму да сацыялізма ўсталёўваецца *дыктатура пралетарыяту.* Па сваім сац. змесце яна карэнным чынам адрозніваецца ад Д. эксплуататарскіх класаў.

Літ.: Маркс К. Кризис и контрреволюция, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 5; Ленін У. І. Перамога кадэтаў і задачы рабочай партыі, Тв., т. 10 (Полн. собр. соч., т. 12); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (там жа, т. 33); яго ж. Пралетарская рэвалюцыя і рэнегат Каўцкі, Тв., т. 28 (там жа, т. 37); яго ж. Да гісторыі пытання аб дыктатуры, Тв., т. 31 (там жа, т. 41); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; гл. таксама літ. пры арт. *Дыктатура пралетарыяту, Дзяржава.*

Ю. М. Манін. Мінск.

ДЫКТАТУРА ПРАЛЕТАРЫЯТУ, дзярж. ўлада рабочага класа, якая ўсталёўваецца ў выніку перамогі сацыялісц. рэвалюцыі для пабудовы сацыялізма. Вучэнне пра Д. п. распрацавана К. Марксам і Ф. Энгельсам і развіта У. І. Леніным ва ўмовах эпохі імперыялізму і пралет. рэвалюцый. Дыктатура служыць пралетарыяту, каб залучыць на свой бок шырокія масы працоўных і інш. дэмакр. сілы для «поўнага звяржэння капітала, поўнага падаўлення супраціўлення буржуазіі і спроб рэстаўрацыі з яе боку», для «канчатковага стварэння і ўмацавання сацыялізма» (Ленін У. І. Тв., т. 29, с. 350—351). Сутнасць і найвышэйшы прынцып Д. п.— саюз рабочага класа і сялянства пры кіруючай ролі рабочага класа. Функцыі Д. п. залежаць ад характару задач, якія вырашаюцца, і знешнепалітычных абставін. Яна ўжывае насілле ў адносінах да ворагаў сацыялізма, але гал. функцыя — гаспадарча-арганізацыйная, выхаваўчая. Д. п. стварае рэальныя ўмовы для развіцця сацыялісц. дэмакратыі, ахоўвае заваёвы пралетарыяту, падтрымлівае антыімперыялісц. вызваленчыя сілы, кіруючыся прынцыпамі пралет. інтэрнацыяналізму. Існуюць розныя дзярж. формы Д. п. Гістар. першай не формаю была Парыжская камуна. У СССР Д. п. ўсталявалася як Саветы. Пасля 2-й сусв. вайны ўзнікла новая форма Д. п.— *народная дэмакратыя.* Кожная форма вызначаецца адзінствам гал. прынцыпаў, але мае і спецыфічныя асаблівасці, якія абумоўліваюцца разнастайнасцю аб'ектыўных умоў пераходу краін ад капіталізму да сацыялізма. Д. п.— гістарычна неабходны і адзіна магчымы сродак пераходу да грамадства без дыктатуры

і класаў. Пры буд-ве сацыялізма яна змяняецца і перарастае «ў палітычную арганізацыю ўсяго народа пры кіруючай ролі рабочага класа на чале з яго авангардам — камуністычнай партыяй. Сацыялістычная агульнанародная дзяржава працягвае справу пралетарскай дыктатуры, служыць арганізуючым пачаткам у вырашэнні задач камуністычнага будаўніцтва» (Да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Тэзісы ЦК КПСС, Мн., 1969, с. 19—20).

Літ.: Маркс К. і Энгельс Ф. Маніфест Камуністычнай партыі, Мн., 1968; Маркс К. Класавая барацьба ва Францыі з 1848 па 1850 г., Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 1, Мн., 1951; яго ж. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Ленін У. І. Задачы пралетарыяту ў нашай рэвалюцыі, Тв., т. 24 (Полн. собр. соч., т. 31); яго ж. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (там жа, т. 33); яго ж. Пралетарская рэвалюцыя і рэнегат Каўцкі, Тв., т. 28 (там жа, т. 37); яго ж. Аб дзяржаве, Тв., т. 29 (там жа, т. 39); яго ж. Аб дыктатуры пралетарыяту.— Эканоміка і палітыка ў эпоху дыктатуры пралетарыяту, Тв., т. 30 (там жа, т. 39); Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—7 чэрв. 1969 г., Мн., 1969; Матэрыялы XXIV з'езду КПСС, Мн., 1971. *А. І. Самаль.* Мінск.

ДЫКТАФО́Н (ад лац. dicto вымаўляю+грэч. phonē мова), апарат для аўтаматычнага запісу і ўзнаўлення мовы чалавека. У адрозненне ад *магнітафона* ўзнаўленне запісу ў Д. можа адбывацца на інш., чым запіс, скорасці, напр., паніжанай, зручнай для машынапісу.

ДЫЛА Язэп Лявонавіч [псеўд. Назар Бываеўскі, Тодар Кулеша; н. 2(14).4.1880, Слуцк], беларускі грамадскі дзеяч і пісьменнік. З служачых. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі і Юр'еўскім вет. ін-це, адтуль выключаны за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях. У 1903—04 працаваў у рэдакцыі газ. «Северо-Западный край» (Мінск), пасля ў выдавецтвах Пецярбурга, Арэнбурга, Казані, Масквы. У студз.—лют. 1919 у складзе першага Бел. сав. ўрада, камісар працы. З жн. 1921 старшыня праўлення Бел. цэнтр. саюза спажывецкіх т-ваў (Цэнтрабелсаюза), у 1923—24 старшыня Дзяржпланавай камісіі БССР, нам. старшыні Камісіі па раяніраванні БССР. У 1924—26 правадз. чл. і вучоны сакратар Ін-та бел. культуры, у 1926—27 дырэктар БДТ-1 (тэатра імя Я. Купалы), пасля дырэктар Ін-та мастацтвазнаўства пры Інбелкульце, нам. загадчыка «Белдзяржкіно». З 1931 у Саратаве. Аўтар п'ес, аповесцей, успамінаў і літ.-крытычных артыкулаў; п'еса «Панскі гайдук» у 1924 пастаўлена ў БДТ-1. Чл. ЦВК БССР у 1921—24.

Тв.: Панскі гайдук, Мн., 1926 (пад псеўд. Назар Бываеўскі); Юнак з Крошына, «Полымя», 1965, № 12; Настася Мякота, «Маладосць», 1968, № 11 (пад псеўд. Тодар Кулеша). *А. І. Мальдзіс.* Мінск.

ДЫЛЕ́МА (грэч. dilēmma двайное меркаванне), разнавіднасць *сілагізму*, пасылкі якога — спалучэнне двух умоўных і аднаго дызюнктыўнага суджэнняў.

У традыц. логіцы адрозніваюць канструктыўны (станоўчы) і дэструктыўны (адмоўны) модусы Д. У скарочанай форме Д. вынікі абодвух умоўных суджэнняў супадаюць. Будова канструктыўнай Д. у традыц. логіцы выражаецца формулай: «Калі *A* ёсць *B*, *C* ёсць *D*. Калі *E* ёсць *F*, *C* ёсць *D*. Але *A* ёсць *B* і *E* ёсць *F*. Адсюль *C* ёсць *D*». Будова скарочанай дэструктыўнай Д. выражаецца формулай: «Калі *A* ёсць *B*, *C* ёсць *D*. Калі *E* ёсць *F*, *C* ёсць *D*. Але *C* не ёсць *D*. Значыць, *A* не ёсць *B* і *E* не ёсць *F*». У штодзённым жыцці Д. пайчасцей разумеецца як палуўпасць толькі дзвюх прапілежных магчымасцей, кожная з якіх цягне за сабою небудыны вынікі. Дэструктыўная Д. часта выкарыстоўваецца ў абвінавачаннях.

Літ.: Горский Д. П. Логика, М., 1963. *Р. А. Левін.* Мінск.

ДЫЛЕЦКІ Мікалай Паўлавіч (каля 1630, Кіеў — г. см. невяд.), украінскі кампазітар, педагог і муз. тэарэтык. Вучыўся ў Варшаве і Вільні, з канца 70-х г. працаваў у Маскве. Вял. значэнне меў яго тэарэт. трактат (існуе ў некалькіх рэдакцыях; мяркуюць, што 1-я рэд.— «Буквар-граматыка спеву мусікійскага...», выд. 1670, Смаленск), у якім Д. абгрунтоўваў замену крукавай натацыі 5-лінейнай нотнай сістэмай, даў асновы *партэсных спеваў*, правілы муз. кампазіцыі, узняў пытанні адпаведнасці паэтычнай і муз. вобразнасці, эмац. ўздзеяння музыкі. З муз. твораў: «Урачыстае песпапенне».

ДЫМ, акладная (падатковая) адзінка ў Русі (9—18 ст.), а таксама ў Македоніі (13—14 ст.), Польшчы і ў Закаўказзі (13—19 ст.).

Пад Д. разумелі дом і двор аднаго ўладальніка. Падатак («падымнае») звычайна браўся з колькасці печаў і дымаходаў у гаспадарцы (у 16—18 ст. на Русі спец. падатак на карысць мясцовай адміністрацыі). У Вял. кн. Літ. у 13 ст. і пазней уладанне зямлёю захоўвалася за сямейнай абшчынай-дварышчам, якое складалася з 3—5 дваро̆ў — «дымо̆ў». Дварышча разглядалася як падатковая адзінка, і феад. павіннасцямі абкладаліся не асобныя дворы — «дымы», а ўсё дварышча.

ДЫМАНОВА, вёска ў Акцябрскім с/с Віцебскага р-на. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 12 *км* на ПдУ ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Забалоцінка, на шашы Віцебск — Орша. 98 ж., гасп. 35 (1971). Клуб, бібліятэка, магазін.

ДЫМАРФІЗМ у біялогіі (ад грэч. *di* двойчы+morphē форма), двухформавасць, наяўнасць у аднаго віду жывёл ці раслін адной мясцовасці дзвюх розных формаў.

Адрозніваюць полавы і экалагічны Д. При полавым самкі і самцы адрозніваюцца паміж сабой памерамі, формаю, колерам, паводзінамі (напр., дарослы самец марскіх коцікаў важыць 170 *кг*, самка 32 *кг*; самцы птушак пераважна маюць апярэнне больш яркае і пышнае; у кукурузы, канапель мужчынскія і жаночыя суквецці розныя формы). Экалагічны Д. выклікаецца неаднолькавымі умовамі жыцця. Разнавіднасць экалагічнага — сезонны Д., напр. белая курапатка, заяц-бляк, плесец ў белым; з кукалак матылька вапесы вясной выводзяцца рыжыя, летам больш цёмныя асобіны.

Літ.: Современные проблемы эволюционной теории, Л., 1967. *В. Ф. Цераховіч.* Мінск.

ДЫМАЦЯГ, вентылятар для выдалення дымавых газаў і павелічэння цягі ў топцы. Ліпаткавае кола Д. больш трывалае, чым у звычайным цэнтрабежным вентылятары. Стварае разраджанне да 14,7 *кн/м²* (1500 *кгс/м²*).

ДЫМЕДРО́Л (алерган, бенадрыл, дыфенгідраміна), процізапаленчае і проціалергічнае лякарства. Выпускаюць у таблетках, парашках, растворах. Назначаюць пры хваробах цэнтр. перв. сістэмы, *алергіі*, прамяневай хваробе. Гл. таксама *Процізапаленчыя сродкі*.

ДЫМІТРЫЯДЗІ Адысей Ахілесавіч [н. 24.6 (7.7).1908, Батум], грузінскі савецкі дырыжор.

Нар. арт. СССР (1958). Праф. (1968). Скончыў Тбіліскую (1930) і Ленінградскую (1936) кансерваторыі. У 1937—47 дырыжор, у 1952—65 гал. дырыжор Тбіліскага т-ра оперы і балета імя Паліяшвілі, у 1947—52 гал. дырыжор Дзярж. сімф. аркестра Груз. ССР, з 1965 у Вялікім т-ры СССР. Першы інтэрпрэтатар многіх муз.-сцэнічных і сімф. твораў сав. кампазітараў (пераважна грузінскіх). Узнаг. 2 ордэнамі.

ДЫМНІЦА (Fumaria), род аднагадовых травяністых раслін сям. дымніцавых. Вядома 50 відаў, пашыраных пераважна ў Міжземнамор'і. У СССР 10, на Беларусі 1 від — Д. лекавая (F. officinalis, нар. назва васпая рута).



Дымніца лекавая: *1* — галінка з кветкамі і пладамі; *2* — кветка; *3* — плод.

Сцябло прамастойнае, вышыня да 40 *см*. Лісце шызае, нібы дымчатае, перыстарассечан а е. Кветкі дробныя, вігаморфныя, фіялетава-ружовыя, ружова-пурпуровыя або бледна-ружовыя, сабраныя ў гронку. Плод — арэшак. Расце на палях, агародах, сметніках. Ядавітая, мае фумаравую к-ту і алкалоід фумарын. Ужываецца як фарбавальнік.

ДЫНАЗАЎРЫ (Dinosauria, грэч. deinós страшны+saũra яшчарка), выкапнёвыя паўзуны, якія жылі ў мезазойскую эру (верхні трыяс — верхні мел). Даўж. да 30 *м*, маса да 50 *т*.

У залежнасці ад будовы таза Д. падзяляюць на яшчаратазавых і птушкатазавых. Да першых належаць двухногія драпежнікі, самым вялікім з якіх быў верхнемелавы тыраназаўр (даўж. да 15 *м*), і амфібіятычныя чацвераногія (верхнеюрскі дыпладок, даўж. больш за 25 *м*). Птушкатазавыя Д. расліннаедныя. Двухногія прадстаўнікі (ігуанадонты, «качканосыя» трахадонты, даўж. 1—15 *м*) без панцыра, водныя ці паўводныя. Чацвераногія птушкатазавыя (даўж. 3,5—9 *м*) — наземныя. Мелі моцны панцыр з касцявых пласцін розпага памеру (каратканогія «танкападобныя» анкілазаўры) або з вялікіх вертыкальных трохвугольных пласцін і шыпоў уздоўж спіны і хваста (стэгазаўры); у цэратопсаў былі рогі і касцявыя каўняры — выступы патылічнай часткі чэрапа, якія прыкрывалі шыю. Найбольшыя скапішчы шкілетаў і касцей Д. выяўлены ў Азіі (Кітай і Пд Манголіі), Паўд. і Паўн. Амерыцы і Усх. Афрыцы.



Дыпладок.

Літ.: Основы палеонтологии. Земноводные, пресмыкающиеся и птицы, М., 1964.

В. В. Шчаглова. Мінск.

ДЫНАМА... (ад грэч. dýnamis сіла), частка складаных слоў, якая паказвае на дачыненне да сілы, энергіі (напр., *дынамометр*).

«ДЫНАМА», усесаюзнае ведамаснае добраахвотнае фізкультурна-спартыўнае таварыства, у якім займаюцца спортам ваеннаслужачыя, супрацоўнікі Мін-ваў унутр. спраў і Камітэтаў дзярж. бяспекі і члены іх сем'яў.

Створана ў 1923 па ініцыятыве Ф. Э. Дзяржынскага. Будуецца паводле тэр.-вытв. прынцыпу і мае пярвічныя арганізацыі — калектывы фіз. культуры і спарт. саветы (рэспубліканскія, абласныя, гарадскія). У т-ве «Д.» культывуюцца многія віды спорту, працуюць кваліфікаваныя трэнеры і інструктары, выхоўваюцца спартсмены высокага класа, створаны спец. дзіцячыя спарт. групы «Юны дынамавец». У БССР арганізавана ў 1924. Выхаванцы т-ва — бел. спартсмены чэмпіёны свету А. Ніканчыкаў, Д. Ніканчыкава, Т. Самусенка, А. Білова (Новікава), шматразовая рэкардсменка свету М. Іткіна і інш. «Д.» узнаг. ордэнам Леніна (1937). *К. А. Куліковіч.* Мінск.

ДЫНАМАМЕТАМАРФІЗМ, гл. ў арт. *Метаморфізм горных пород*.

ДЫНАМАМЕТРЫЯ (ад *дынама...*+*...метрыя*), метад вымярэння максімальнай сілы розных мышачных груп чалавека (пераважна пры ізаметрычным рэжыме іх работы). Ажыццяўляецца з дапамогай спец. прылад — мед. дынамометраў. Выкарыстоўваецца ў антрапалогіі, неўрапаталогіі, артапедыі, курортналогіі, ваен. медыцыне, фізіялогіі, гігіене працы, у спарт. медыцыне для вызначэння фіз. развіцця спартсменаў.

ДЫНАМІК, скарочаная назва электрадынамічнага *гучнагаварыцеля*.

ДЫНАМІКА, раздзел механікі, які вывучае рух матэрыяльных целаў пад дзеяннем прыкладзеных да іх сіл. Грунтуецца на трох асн. законах (гл. *Ньютана законы механікі*). У Д. рашаюцца задачы двух тыпаў: вызначэнне сіл, што дзейнічаюць на цела (ці мех. сістэму) па вядомым законе руху, і вызначэнне закону руху па вядомых сілах. Другі тып задач асноўны ў Д. У выніку вывучэння руху асобных аб'ектаў метадамі Д. ўзнік шэраг спец. дысцыплін — *балістыка, нябесная механіка, дынаміка збудаванняў, дынаміка механізмаў і машын* і інш.

Задачы Д. рашаюцца з дапамогаю дыферэнцыяльных ураўненняў руху. Яны паказваюць залежнасць паміж сіламі, якія дзейнічаюць на сістэму, мерай інертнасці сістэмы і параметрамі, што вызначаюць становішча сістэмы ў прасторы. Для руху матэрыяльнага пункта і вярчальнага руху цвёрдага цела гэта ўраўненні тыпу другога закону Ньютана. Для дэфармаваных целаў, вадкасцей і газаў ураўн. руху — дыферэнцыяльныя ўраўненні ў частковых вытворных. Да іх далучаюцца ўраўненні, што характарызуюць некат. ўласцівасці асяроддзя (напр., залежнасць шчыльнасці ад ціску ці мех. напружанняў, ад дэфармацыі і інш.). Дыферэнцыяльныя ўраўн. руху сістэмы матэрыяльных пунктаў можна атрымаць не толькі з аск. законаў, але і з *варыяцыйных прынцыпаў механікі*. Каб знайсці закон руху мех. сістэмы, трэба ведаць сілы і т. зв. пачатковыя ўмовы, г. зн. каардынаты і скорасці пунктаў сістэмы ў пачатковы момант часу. Для дэфармаваных целаў, вадкасцей і газаў трэба ведаць яшчэ і граніцныя ўмовы (гл. *Краявая задача*). Для звязных мех. сістэм, рух якіх абмежаваны *сувязямі механічнымі*, аск. задача Д. распадаецца на дзве: вызначэнне закону руху сістэмы і знаходжанне рэакцый сувязей. У выпадку т. зв. галаномных сувязей (абмежаванні накладзены толькі на каардынаты пунктаў сістэмы, а не на скорасці) дыферэнцыяльныя ўраўненні руху можна атрымаць у выглядзе т. зв. ураўн. Лагранжа. У іх не ўваходзяць рэакцыі сувязей, і іх колькасць не залежыць ад колькасці целаў ці пунктаў сістэмы і роўная ліку ступеняў свабоды сістэмы.

Літ.: Тарг С. М. Краткий курс теоретической механики, 6 изд., М., 1968; Бухгольц Н. Н. Основной курс теоретической механики, ч. 1, 8 изд., ч. 2, 5 изд., М., 1969. *А. І. Болсун.* Мінск.

ДЫНАМІКА (у музыцы), сукупнасць з'яў, звязаных з інтэнсіўнасцю сілы гуку і яе зменамі ў творы.

Асн. градацыі (адценні) сілы гуку прынята абазначаць італьян. тэрмінамі fortissimo (ff) — вельмі гучна, forte (f) — гучна, mezzo forte (mf) — умерана гучна, mezzo piano (mp) — умерана ціха, piano (p) — ціха, pianissimo (pp) — вельмі ціха; паступовае ўзмацненне гуку — crescendo (графіч. ), паслабленне — diminuendo (), рантоўную змену сілы — subito. Д. ўключае і *акцэнты*.

ДЫНАМІКА ЗБУДАВАННЯЎ, раздзел *будаўнічай механікі* пра метады разліку збудаванняў на трываласць, жорсткасць і ўстойлівасць пад дзеяннем дынамічных нагрузак.

Д. з. уключае разлік на *рэзананс*, вылічэнне дэфармацый і напружанняў, спосабы памяншэння ваганняў буд. канструкцый пры дзеянні знакапераменных ці ўдарных нагрузак (вібрацыйных ад работы машын з неўраўнаважанымі масамі, сейсмічных, ветраных, кранавых, транспартных, ад капрароў і молатаў і інш.). Д. з. вывучае агульныя прынцыпы тэорыі хістанняў, дынаміку прамысл. будынкаў і фундаментаў машын, сейсмаўстойлівасць збудаванняў, дынаміку мастоў і падкранавых канструкцый, дынаміку высокіх і гнуткіх збудаванняў, стомленасць (выносліваць) матэрыялаў. Каб паменшыць хістанні, выкарыстоўваецца вібраізаляцыя і распрацоўваюцца больш надзейныя схемы буд. канструкцый.

Літ.: Киселев В. А. Строительная механика, 2 изд., М., 1969; Безухов Н. И., Лужин О. В. и Колкунов Н. В. Устойчивость и динамика сооружений в примерах и задачах, 2 изд., М., 1969; Снитко Н. К. Динамика сооружений, Л.— М., 1960; Яблонский А. А. и Норейко С. С. Курс теории колебаний, 2 изд., М., 1966.

ДЫНАМІКА МЕХАНІЗМАЎ І МАШЫН, раздзел тэорыі механізмаў і машын, у якім вывучаецца рух механізмаў і машын пад уздзеяннем сувязі з сіламі, прыкладзенымі да іх звеньняў. Асн. задача Д. м. і м.— вызначэнне сіл па зададзеным законе руху звеньняў і наадварот — закону руху звеньняў па зададзеных сілах.

Для вызначэння закону руху складаецца і рашаецца ўраўненне руху механізма ў дыферэнцыяльнай ці энергетычнай форме; яно звязвае рух звеньняў з масамі і сіламі, да іх прыкладзенымі. У агульным выпадку дыферэнцыяльнае ўраўненне руху інтэгруецца толькі прыблізна лічбавымі метадамі. Пры складанні ўраўнення руху карыстаюцца метадам прывядзення сіл і мас, які дазваляе замяніць задачу пра рух сістэмы звеньняў больш простай, эквівалентнай у дынамічных адносінах задачай пра рух аднаго звяна (для механізмаў з адной ступенню свабоды). Пасля вызначэння закону руху звеньняў праводзіцца т. зв. сілавы разлік — знаходжанне рэакцый, якія дзейнічаюць на звенні. Гэтыя рэакцыі выклікаюцца не толькі вонкавымі, але і дынамічнымі сіламі; апошнія ўзнікаюць пры неўраўнамерным руху звеньняў. Дынамічныя сілы ўлічваюцца, паводле прынцыпу Д'Аламбера (гл. *Вагульныя прынцыпы механікі*), увядзеннем сіл інерцыі. Памяншэнне дынамічных сіл, якія выклікаюць дадатковыя напружанні і вібрацыю звеньняў механізма і фундамента, дасягаецца рацыянальным падборам мас звеньняў (задача ўраўнаважвання сіл інерцыі механізмаў). Метады вызначэння рэакцый без уліку сіл інерцыі вывучае статыка механізмаў, з улікам сіл інерцыі — *кінетастатыка механізмаў*. У Д. м. і м. разглядаецца таксама задача пра рэгуляванне скорасці руху і забеспячэнне зададзенага рэжыму работы. Рэгуляванне перыяд. ваганняў скорасці ажыццяўляецца ўстаноўкай махавіка, рэгуляванне неперыяд. ваганняў скорасці дасягаецца з дапамогаю рэгулятараў. Задачамі Д. м. і м. з'яўляюцца таксама вызначэнне сіл трэння і іх уплыву на работу механізмаў, знаходжанне механічнага кпдз, які характарызуе ступень дасканаласці машыны ў энергетычных адносінах. Першым у сусветнай літаратуры сістэматычным курсам Д. м. і м. была праца М. І. Мярцалава «Дынаміка механізмаў» (1914). Відомы таксама работы інш. рускіх вучоных — М. Я. Жукоўскага, І. А. Вышнеградскага, М. П. Пятрова і інш. Вялікі ўклад у развіццё Д. м. і м. зрабілі сав. вучоныя І. І. Артабалеўскі, М. Р. Бруевіч і інш. Развіццё Д. м. і м. у апошнія гады характарызуецца шырокім выкарыстаннем сучаснага матэм. апарату. Гл. таксама *Механізмаў і машын тэорыя*.

Літ.: Артоболевский И. И. Теория механизмов, 2 изд., М., 1967; Зиновьев В. А. и Бессонов А. П. Основы динамики машинных агрегатов, М., 1964; Колчин Н. И. Механика машин, т. 1—2, 2 изд., М.— Л., 1962—63; Марголин Ш. Ф. Теория механизмов и машин, Мн., 1968.

В. К. Акуліч. Мінск.

ДЫНАМІКА ПАДЗЕМНЫХ ВОДАЎ, вучэнне пра рух падземных водаў, частка тэорыі фільтрацыі вадкасцей і газаў у порыстым асяроддзі.

Вывучае характар руху падземных водаў да свідравін, гідратэхнічных збудаванняў, паміж ваданоснымі гарызонтамі, а таксама рэжым, баланс, запасы і кіраванне ўзроўнем грунтавых водаў у рэгіянальным маштабе. Мае важнае значэнне пры буд-ве вялікіх гідратэхнічных збудаванняў, асушэнні балотных масіваў, эксплуатацыі шахтаў, кар'ераў, водазабеспячэнні, штучным папаўненні запасаў падземных водаў і інш.

Літ.: Силин-Бекчурин А. И. Динамика подземных вод, 2 изд., М., 1965; Чарный И. А. Подземная гидрогазодинамика, М., 1963.

ДЫНАМІЧНАЕ ПРАГРАМАВАННЕ, матэматычны метад рашэння задач аптымізацыі шматэтапных працэсаў, у якіх вынік выканання папярэдніх этапаў уплывае на ход наступных.

Многія задачы *аперацый даследавання* натуральна распадаюцца на паслядоўныя этапы, у інш. выпадках такі падзел можна ўвесці штучна. У вялікім класе задач знаходжанне найлепшага рашэння для асобнага этапа працейшае, чым аптымізацыя ўсяго працэсу цалкам. Магчымасць замены складанай задачы аптымізацыі некалькімі больш простымі абгрунтавана прынцыпам аптымальнасці Р. Беллмана: калі планаванне працэсу аптымальнае, то яно будзе такім жа і для працэсу, які астаецца пасля выканання першага этапа. Гэты прынцып лёг у аснову Д. п. Матэм. запіс прынцыпу аптымальнасці для кожнай канкрэтнай задачы прыводзіць да функцыянальных ураўн., многія з якіх добра рашаюцца з дапамогай сучаснай вылічальнай тэхнікі. Д. п. карыстаюцца ў тэорыі аўтам. рэгулявання і ў матэм. эканоміцы.

Літ.: Вентцель Е. С. Элементы динамического программирования, М., 1964; Беллман Р. Динамическое программирование, пер. с англ., М., 1960; Беллман Р. и Дрейфус С. Прикладные задачи динамического программирования, М., 1965.

В. С. Айзенштат, М. А. Лепяшынскі. Мінск.

ДЫНАМІЧНЫ СТЭРЭАТЫП (ад грэч. dynamikos рухомы, stereos цвёрды + typos адбітак), устойліва замацаваная сістэма ўмоўных нервовых сувязей, якая забяспечвае пэўную інтэнсіўнасць і паслядоўнасць рэакцый арганізма на дзеянні навакольнага асяроддзя.


Фарміруецца, калі дзеянні адных і тых жа раздражняльнікаў шмат разоў паўтараюцца пэўны час і ў пэўнай паслядоўнасці з пастаяннымі інтэрваламі. Умоўныя рэфлексы, якія ўтвараюцца ў выніку гэтага працэсу, замацоўваюцца і аб'ядноўваюцца ў цэласную, адносна ўстойлівую сістэму. Д. с. ляжыць у аснове шэрагу а'яў псіхікі — навыкаў, звычак, набытых патрэб і інш. Біял. значэнне Д. с. у тым, што з яго замацаваннем звязана лёгкасць, дакладнасць і пастаянства рэакцый, а гэта эканоміць расходаванне нерв. энергіі на выкананне адпаведнай работы. Рэзкая змена выпрацаванага спосабу жыцця ломіць устаўленыя Д. с., што адмоўна адбіваецца на вышэйшай нерв. дзейнасці і нярэдка выклікае неўрозы.

Літ.: Павлов И. П. Динамическая стереотипия высшего отдела головного мозга, Полн. собр. соч., 2 изд., т. 3., кн. 2, М.— Л., 1951; Дмитриев А. С. Физиология высшей нервной деятельности, М., 1964.

В. М. Кавалёў. Мінск.

ДЫНАМОМЕТР (ад *дынама...+...метр*), сілямер, прылада для вымярэння велічыні механічнай сілы.

Асноўныя элементы Д.— сілавое звяно і паказальнік. Сіла, якую вымяраюць, прутка дэфармуе сілавое звяно; дэфармацыя перадаецца паказальніку, той адзначае вынік у адпаведных адзінках. Д. бываюць механічныя, гідраўлічныя і электрычныя; у апошніх сілавым звяном з'яўляюцца п'езакварцавыя, магнітастрыкцыйныя, індукцыйныя, ёмістасныя і інш. *датчыкі*. Падзяляюцца Д. на цягавыя (вымяраюць толькі сілу) і вярчальныя (вымяраюць момант сілы); паводле прызначэння — на ўзорныя і рабочыя. Узорныя выкарыстоўваюцца для праверкі машын і прылад, а таксама пры мех. выпрабаваннях матэрыялаў. Рабочыя Д. вымяраюць сілу цягі лакаматываў, трактараў і інш. і сілы, якія дзейнічаюць у элементах машын пры выпрабаваннях іх у эксплуатацыйных умовах. Д. з пішучымі паказальнікамі наз. дынамографамі, з лічыльнымі паказальнікамі — работамерамі. Прыклад найпрасцейшага Д.— медыцынскі, са спружынавым сілавым звяном і стрэлачным паказальнікам.



Спружынавы дынамометр.

ДЫНАР (лац. denarius рымская манета), 1) арабскі Д.— залатая манета краін мусульманскага Усходу (з 7 ст.), маса каля 2,4 *г*. 2) У грашовай сістэме Ірана да рэформы 1932 — лічыльная адзінка, Д.=$^1/_{10000}$ тумана, пасля рэформы Д.=$^1/_{100}$ рыяла. 3) Грашовая адзінка Алжырскай Нар. Рэспублікі. Д.=100 сантымам. Курс (на 3.8.1971): 100 Д.=18,23 руб. 4) Грашовая адзінка Ірака. Д.=1000 філсам. Курс (на 3.8.1971): 1 Д.=2,52 руб. 5) Грашовая адзінка Іарданіі. Д.=10 дырхемам=100 піястрам=1000 філсам. 6) Грашовая адзінка Кувейта. Д.=10 дырхемам=1000 філсам. 7) Грашовая адзінка Нар. Дэмакр. Рэсп. Емен. Д.=1000 філсам. Курс (на 3.8.1971): 1 Д.=2,16 руб. 8) Граш. адзінка Туніса. Д.=1000 мілімам. Курс (на 3.8.1971): 1 Д.=1,71 руб. 9) Граш. адзінка Югаславіі. Д.=100 пара. Курс (на 3.8.1971): 100 Д.=6 руб.

ДЫНГА (Canis dingo), драпежная млекакормячая жывёла з сям. сабачых.



Нагадвае аўчарку. Пераважна рудога або бледна-жоўтага колеру, радзей чорнага, іншы раз з белымі плямамі. Пашырана ў Аўстраліі, амаль адзіны прадстаўнік вышэйшых (плацэнтарных) млекакормячых у яе фаўне. У прыплодзе 6—8 шчанят. Палюе на дзікіх і свойскіх жывёл. Д. лічаць за адзічэлага сабаку, завезенага з а-воў Ціхага акіяна.

ДЫНІЯ (Melo), род аднагадовых травяністых раслін сям. гарбузовых. Відома 15 відаў; у культуры 9. У СССР пашырана ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, у Ніжнім Паволжы, Малдавіі, паўд. абласцях Украіны, Закарпаллі, на Каўказе. На Беларусі вырошчваюць Д. аматары-агароднікі. Лепшыя сарты, якія высяваюць у рэсп.: Калгасніца, Алтайская, Грунт, Грыбаўская, Куставая 11, Камунарка.



Дыня Камунарка.

Сцябло паўзучае, цвёрдавалаcістае. Лісце вялікае, цэласнае або лопасцевае. Кветкі пераважна раздзельнаполыя, пасякомаапыляльныя. Плод — шматнасенная несапраўдная ягада з сакаўной, салодкай, духмянай мякацью, багатай на цукры (9—21%), харч. алей (25—30%), вітамін С.

Літ.: Пангало К. И. Дыни, Кишинев, 1958.

ДЫПЛАКОКІ (грэч. diplóos двайны + kókkos насенне ў пладах), бактэрыі паранадобнай формы (кокі), размешчаныя парамі.

Будова Д. абумоўлена тым, што пры дзяленні бактэрый у адной плоскасці 2 новыя асобіны не разыходзяцца. Д. не маюць жгуцікаў, не ўтвараюць спораў. Належаць да сям. Cocaceae, якое аб'ядноўвае 2 роды: Diplococcus і Neiseria. Ёсць сапрафіты, якія жывуць у глебе, вадзе, і хваробныя формы: пнеўмакокі — узбуджальнікі крупознага запалення лёгкіх, менінгакокі — эпідэмічнага менінгіту, ганакокі — ганарэі і інш.

ДЫПЛАМАТ (франц. diplomate), асоба, якая знаходзіцца на дыпламатычнай службе ў ведамстве замежных спраў або ў дыпламатычным прадстаўніцтве за мяжою. Для дыпламат. персаналу існуе сістэма *дыпламатычных рангаў*. На тэр. іншых краін Д. карыстаюцца дыпламат. недатыкальнасцю.

ДЫПЛАМАТЫКА (ад грэч. diploma дыплом), дапаможная гістар. дысцыпліна, якая вывучае паходжанне, форму і змест актавых крыніц (пераважна эпохі феадалізму) для вызначэння іх сапраўднасці.

Некат. праверка сапраўднасці актаў (практычная Д.), выкліканая барацьбой за вямлю і феад. прывілеі, адбывалася ўжо ў сярэднія вякі. У 14—15 ст. пачала развівацца навуковая Д., да 19 ст. цесна звязаная з практычнай Д. У перыяд распаду феадалізму Д., якая выкрывала фальсіфікацыю дакументаў феад. эпохі (падробленыя граматы каталіцкай царквы, феадалаў), была адным са сродкаў клас. барацьбы буржуазіі супраць феадалаў. Бурж. Д. набыла характар фармальнай Д., якая не закранае сац.-эканам. сутнасці дакументаў. Марксісцкая гістар. навука разглядае Д. як частку агульнага крыніцазнаўства і ўключае ў задачы Д. даследаванне як формы, так і зместу дакументаў.

На тэр. Беларусі ў 16—19 ст. мела месца фальсіфікацыя дакументаў, выкрыццё якой прывяло да ўзараджэння практычнай Д. Вядома, што ў 1721—43 (бліжэй да 1721) князі Радзівілы зрабілі фальшывы дакумент ад імя Жыгімонта II Аўгуста з датай 3.11.1551, паводле якога атрымалі права захоўваць дзярж. дакументы Вял. княства Літ. ў іх прыватным архіве ў Нясвіжы. У 1-й пал. 19 ст. шырока распаўсюджвалася падробка дакументаў аб прыналежнасці да шляхецтва ў сувязі з праверкай правоў на дваранства ў зах. губернях Расіі, асабліва пасля паўстання 1830—31. Нярадка асобы з падробленымі прывілеямі зацвярджаліся ў дваранстве.

Літ.: Лихачев Н. П. Дипломатика, СПб., 1901; Зимин А. А. Методика издания древнерусских актов, М., 1950; Введенський А. А. Підробка і фальсифікація історичних документів на Україні і в Білорусії в XVI—XIX ст., «Наукові записки Київського державного пед. ін-ту», 1939, т. 3.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ДЫПЛАМАТЫЧНАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА, пастаянны орган, які выконвае функцыі афіц. прадстаўніцтва адной дзяржавы на тэрыторыі другой. Адрозніваюць *пасольствы* (узначальваюцца паслом) і *місіі* (узначальваюцца пасланнікам або часовым павераным).

Д. п. складаецца з пераважнай дыпламатычнага, які ўзначальваецца дыпламатам, прызначаным і зацверджаным ураднай установай прымаючай краіны (у СССР — Прэзідыумам Вярх. Савета СССР), і дыпламатычнага персаналу, які ўзначальваецца кіраўніком Д. п. (пасол, пасланнік, павераны ў справах). Статус кіраўніка Д. п. і яго персаналу вызначаецца Венскай канвенцыяй 1961 (ратыфікавана СССР 6.6.1964). Статус замежных Д. п. у СССР вызначаецца Палажэннем аб дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтвах замежных дзяржаў на тэр. СССР ад 23.5.1966.

У. П. Грэкаў, Мінск.

ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ РАНГІ, ступені адрознення, што вызначаюць старшынства асоб, якія ўзначальваюць дыпламатычныя прадстаўніцтвы, і асоб дыпламат. персаналу.

У міжнар. практыцы прынята прызнаваць за СССР прынцып прызначэння Д. р. у залежнасці ад аб'ёму і значэння ўсталяванага на дыпламат. абмене (Указ Прэзідыума Вярх. Савета СССР ад 28.6.1963 «Аб вызначэнні паслоў Д. р.»). Вызначаюцца і падтрымліваюцца пасол, надзвычайны і паўнамоцны пасланнік 1-га і 2-га класаў, саветнік 1-га і 2-га класаў, першы сакратар 1-га і 2-га класаў, другі сакратар 1-га і 2-га класаў, трэці сакратар, аташэ.

ДЫПЛАМАТЫЯ (франц. diplomatie), сукупнасць прыёмаў, метадаў і прынцыпаў формаў для ажыццяўлення мірнымі сродкамі мэтаў і задач знешняй палітыкі дзяржавы. Вызначэнне інтарэсаў нацыянальнай бяспекі. Афіцыйна ажыццяўляецца асобай, якая ўзначальвае дзяржаву, урадам, міністэрствамі замежных спраў і іх агентамі, замежнымі прадстаўнічымі дзяржавы.

Аб. форма дыпламат. дзейнасці = канферэнцыя дыпламатаў, канферэнцыя, кангрэс, дыпламатычны, консульскі. Д. прызнаецца або адхіляецца, і рабочыя кантакты пры гэтым спыняюцца, або ўстанаўліваюцца нармальныя адносіны, і пачынаюцца перамовы, ажыццяўляецца абмен дыпламат. прадстаўніцтвамі. Д. выкарыстоўваецца для ўрэгулявання канфліктаў, прадухілення ваен. канфліктаў, для ўмацавання міжнар. міру і бяспекі. Д. ажыццяўляецца ў розных формах: двухбаковыя перамовы, перамовы ў рамках міжнар. арганізацый, канферэнцый, сустрэчы на вышэйшым узроўні, дыпламат. місіі, спецыяльныя місіі, дыпламат. кур'ер, дыпламат. пошта, дыпламат. імунітэт, дыпламат. пратакол, дыпламат. ранг, дыпламат. этыкет, дыпламат. мова (французская, англійская, руская, іспанская, нямецкая, італьянская, арабская, кітайская).

*Гісторыя Д. пачынаецца з часоў старажытнасці. Першыя дыпламат. прадстаўніцтвы ўзніклі ў Старажытным Егіпце, Старажытнай Грэцыі, Старажытным Рыме, Старажытным Кітаі, Старажытнай Індыі. Развіццё Д. ў Новы час звязана з развіццём капіталізму, з фарміраваннем нац. дзяржаў. Першыя пастаянныя дыпламат. прадстаўніцтвы ўзніклі ў Італіі ў 15 ст. Да 17 ст. Д. ажыццяўлялася ў асноўным у выглядзе часовых дыпламат. місій. Пастаянныя дыпламат. прадстаўніцтвы ў Еўропе ў 17—18 стст. Пасля Вялікай Французскай рэвалюцыі 1789—94 Д. ператварылася ў сродак барацьбы буйных дзяржаў за гегемонію ў Еўропе. Пасля Кастлрэйскага кангрэса 1814—15 Д. ператварылася ў сродак барацьбы еўрап. дзяржаў за ўмацаванне сістэмы саюзаў, створанай на Венскім кангрэсе 1814—15. Пасля Парыжскага кангрэса 1856

фіцыентаў ураўнення і ператвараецца ў нуль у тым, і толькі ў тым выпадку, калі сярод каранёў ураўн. ёсць роўныя. Напр., Д. квадратнага ўраўн. $x^2+px+q=0$ роўны p^2-4q, кубічнага ўраўн. $x^3+px+q=0$ роўны $-4p^3-27q^2$.

ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ (лац. discriminatio адрозніванне), абмежаванне або пазбаўленне правоў асобных грамадзян ці катэгорый насельніцтва (а таксама арганізацый і нават дзяржаў) з-за нацыянальнасці, расавай прыналежнасці, полу, веравызнання і інш.

У бурж. краінах асабліва пашырана расавая Д., якая адкрыта ажыццяўляецца ў ЗША ў адносінах да неграў, індзейцаў, яўрэяў і інш. нац. меншасцяў, у Ізраілі — да арабаў, у краінах Афрыкі: Паўд.-Афр. Рэспубліцы (ПАР), Паўд. Радэзіі, Анголе, Мазамбіку, Гвінеі (Бісаў), дзе каланізатары прыгнятаюць мясцовае насельніцтва (гл. *Апартэід, Антысемітызм, Генацыд, Сегрэгацыя*); Д. жанчын, якім плацяць менш, чым мужчынам, за адну і тую ж работу, абмяжоўваюць ці пазбаўляюць іх выбарчага права, звальняюць служачых, якія працуюць у дзярж. установах, за прагрэс. погляды. У міжнар. адносінах Д. выяўляецца ў тым, што іншаземцы пазбаўляюцца некат. правоў з-за нац. паходжання ці прыналежнасці да той ці іншай краіны, а таксама абмяжоўваюцца гандл. зносіны з пэўнымі краінамі. Напр., пасля правалу інтэрвенцыі ў Сав. Рэспубліку капіталіст. краіны хацелі блакадай падарваць яе эканоміку.

СССР і сацыялістычныя краіны змагаюцца супраць усялякіх відаў Д. і вядуць палітыку раўнапраўя і дружбы народаў. У канстытуцыях сацыялістычных краін замацаваны і паслядоўна ажыццяўляецца прынцып роўнасці грамадзян незалежна ад полу, расы, нацыянальнасці, рэлігійных поглядаў і інш.

Літ.: Чиркин В. Е. Дискриминация национальных меньшинств в США, М., 1958; Геевский И. А. Расистская политика американского империализма, 2 изд., М., 1954; Оганисьян Ю. Империализм и расизм, М., 1970; Балицкий Я. Расизм в Южной Африке, пер. с польск., М., 1953.

А. А. Прымачонак. Мінск.

ДЫСКРЭТНАСЦЬ (ад лац. discretus раздзелены, перарваны), перарыўнасць; процілегласць неперарыўнасці. Напр., сістэма цэлых лікаў (у процілегласць сістэме сапраўдных лікаў) — дыскрэтная. У фізіцы Д. азначае перарыўнасць будовы матэрыі (не атамістычнасць), а таксама перарыўны (квантавы) характар працэсаў выпрамянення ў атамах і малекулах.

ДЫСЛАКАЦЫІ (ад познелац. dislocatio перамяшчэнне) у крышталях, лінейныя дэфекты *крышталічнай рашоткі*, якія парушаюць правільнае чаргаванне атамных плоскасцей. Дзякуючы Д. *крышталі* могуць пластычна дэфармавацца (гл. *Дэфармацыя*) і разбурацца пад дзеяннем напружанняў на некалькі парадкаў меншых за тыя, што вылічаны для ідэальных крышталяў.

Літ.: Дислокация в кристаллах (библиогр. указатель), М., 1966.

ДЫСЛАКАЦЫІ (у геалогіі), парушэнні залягання горных парод у зямной кары. Падзяляюцца на складкавыя (плікатыўныя) і разрыўныя (дыз'юнктыўныя). Адбываюцца ў нетрах зямной кары ад тэктанічных рухаў, а прычыны пераўтварэння крышталічнай будовы горных парод, ад пластычнай дэфармацыі солі пад вялікім ціскам (гл. *Саляная тэктоніка*), ад ціску рухомага ледавіка (гл. *Гляцыядыслакацыі*), ад апаўзання горных парод (гл. *Апоўзні*).

Найб. вялікія Д. тэктанічнага паходжання, калі ў выніку іх у геасінклінальях утвараюцца горныя хрыбты і міжгорныя ўпадзіны (антыклінорыі і сінклінорыі), а на платформах — вялізныя, падобныя на сподак упадзіны (сінеклізы, або мульды) і купалападобныя складкі (гл. *Складкі горных парод*). Складкавыя Д. ўскладняюцца разрывнымі парушэннямі, якія часам пераважаюць (гл. *Разрывы тэктанічныя*).

Літ.: Гл. пры арт. *Тэктоніка.*

ДЫСНЕЙ (Disney) Уолт (5.12.1901, Чыкага — 15.12.1966), амерыканскі кінарэжысёр, мастак, прадзюсер. З 1920 працаваў у кіно. Аўтар вядомых серый мультыплікац. фільмаў пра мышаня Мікі Маўса (з 1928), качаня Дональда Дака (з 1929), фільма «Тры парасяці» (1933), поўнаметражных каляровых «Беласнежка і сем гномаў» (1938), «Бэмбі» (1942) і інш.

Літ.: Арнольди Э. М. Жизнь и сказки Уолта Диснея, Л., 1968.

ДЫСПАНСЕР (франц. dispensaire, ад лац. dispenso размяркоўваю), лячэбна-прафілактычная ўстанова, аснова дзейнасці якой — сінтэз санітарных і лячэбных задач: актыўнае выяўленне і лячэнне хворых, дынамічны нагляд і ажыццяўленне санітарна-аздараўленчых мерапрыемстваў (гл. *Дыспансерызацыя*). У БССР на пач. 1971 былі Д.: процітуберкулёзныя (81), анкалагічныя (11), скурна-венералагічныя (35), псіханеўралагічныя (10), процівалляровыя (7), урачэбна-фізкультурныя (15), трахаматозныя (1).

Першыя Д. створаны ў Англіі ў канцы 18 ст. дабрачыннымі т-вамі, пераважна для хворых на туберкулёз беднякоў. У капіталіст. краінах Д.— установы найчасцей філантрапічныя або мясцовых самакіраўніцтваў. У Расіі Д. паявіліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. Першыя «дыспансеры для бедных» у Пецярбурзе створаны Медыка-філантрапічным камітэтам у 1804. У Маскве процітуберкулёзны Д. адкрыты ў 1919, у Мінску ў 1921. Папярэднікамі Д. на Беларусі (Мінск, Бабруйск) былі процітуберкулёзныя амбулаторыі (1910—11).

Літ.: Гл. пры арт. *Дыспансерызацыя.*

ДЫСПАНСЕР УРАЧЭБНА-ФІЗКУЛЬТУРНЫ, лячэбна-прафілактычная ўстанова ўрачэбнага кантролю і лячэбнай фізкультуры.

Ажыццяўляе назіранне за станам здароўя і дынамікай працаздольнасці спартсменаў, дыспансерызацыю вядучых спартсменаў, навучэнцаў дзіцячых, юнацкіх школ і школ спартыўнай моладзі. Арганізуе ўрачэбна-спарт. кансультацыі, мед. абслугоўванне спарт. спаборніцтваў, вучэбна-трэніровачных абораў, намагае арганізацыям фіз. культуры ў барацьбе з траўматызмам пры занятках спортам і г. д. У БССР адзін рэспубліканскі, 6 абласных і 8 гарадскіх Д. у.-ф. Працуюць таксама 53 кабінеты ўрачэбнага кантролю і 165 кабінетаў лячэбнай фізічнай культуры.

К. К. Забароўскі. Мінск.

ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЯ, прафілактычныя і лячэбныя мерапрыемствы, якія ажыццяўляюцца *дыспансерамі* для ўмацавання здароўя і захавання працаздольнасці насельніцтва. Уключае пастаянны нагляд за станам здароўя асоб, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку, вывучэнне і аздараўленне ўмоў іх працы і быту, актыўнае выяўленне і лячэнне хворых на пачатковых стадыях хвароб, прадухіленне індывідуальнай і сац. прафілактыкі.

Д.— агульны і адзіны метад усіх лячэбна-прафілактычных устаноў у СССР і БССР, дзе на дыспансерным уліку каля 50% насельніцтва. Уведзена з 1910—21 як спосаб работы ўстаноў аховы маці

і дзіцяці, з 1925—27 — прамысл. рабочых. Адрозніваюць 2 формы Д.: здаровых асоб (дзяцей, падлеткаў, ціжарных, спартсмены) і хворых (хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы, лёгачная хвароба, цукровы дыябет, туберкулёз, новаўтварэнні і інш.).

Літ.: Батыс Г. А. и Лекарев Л. Г. Социальная гигиена и организация здравоохранения, М., 1969; Майстрах К. В. Диспансерный метод работы лечебно-профилактических учреждений, М., 1955.

А. К. Касач. Мінск.

ДЫСПЕПСІЯ дзіцячая (*дыс...*+грэч. pepsis стараванне), вострая хвароба страваваль-на-кішачнага тракту з расстройствам стараванне ў дзяцей першага году жыцця.

Адрозніваюць 2 формы: простую з вадкім і частым надворкам (15—20 разоў за суткі), ірвотаю, без значнага парушэння агульнага стану; таксічную з выражанай інтаксікацыяй і парушэннем функцый усіх органаў і сістэм. Найчасцей бывае ў аслабелых, хворых на дыятэз і дыстрафію дзяцей. Лячэнне: водна-чайная дыэта, дазаванае харчаванне, ферменты, вітаміны, антыбіётыкі, сімптаматычная сродкі. Прафілактыка: грудное кармленне, агульнае ўмацаванне дзіцяці.

Літ.: Многотомное руководство по педиатрии, т. 4, М., 1963 (бібліягр.); Усов И. Н. и Мазо Р. Э. Пособие по педиатрии для врачей, Мн., 1969.

А. К. Усцінавіч. Мінск.

ДЫСПЕРСІЙНЫЯ ФІЛЬТРЫ, аптычныя прылады, якія прапускаюць параўнальна вузкі ўчастак спектра выпрамянення і прынцып дзеяння якіх заснаваны на выбіральным рассеянні святла.

У 1884 Г. Хрысціянсен, вывучаючы паказчыкі пераламлення сістэмы крышталічны парашок — вадкасць, заўважыў, што, прайшоўшы праз такую сістэму, святло становіцца амаль манахраматычным. Т. ч. праходзіць толькі святло з частотамі, блізкімі да некаторай частаты ω_0. Для такой частаты паказчыкі пераламлення крышталю $n_к$ і вадкасці $n_в$ адпольскавыя; светлавыя пучкі іншых частот $\omega+\omega_0$ рассейваюцца тым больш, чым большая для іх розніцы паміж $n_к$ і $n_в$. Адбываецца «фільтрацыя» святла па частаце.

У бачным і ультрафіялетавым дыяпазонах хвалі Д. ф. не набылі пашырэння, паколькі спектральныя характарыстыкі фільтраў крышталь — вадкасць нястойлівыя да змены т-ры, а для іх вырабу патрэбны герметычныя кюветы. Для большасці матэрыялаў у інфрачырвонай вобласці спектра дысперсійныя крывыя такія, што пры некат. частаце $n_к=1$. Гэта дае магчымасць замест вадкасці выкарыстоўваць паветра, бо $n_{пав}$ таксама роўны 1 (фільтры крышталь — паветра). Пад кіраўніцтвам акад. АН БССР М. А. Барысевіча распрацаваны новы тып Д. ф., двума кампанентамі якіх з'яўляюцца крышталічныя матэрыялы або палімеры. Д. ф. крышталь — крышталь перавышаюць вядомыя раней Д. ф. па мех. трываласці; іх спектральныя характарыстыкі не мяняюцца ў шырокім інтэрвале тэмператур. Д. ф. маюць перавагу, напр. высокую кантрастнасць, адсутнасць пабочных палос прапускання, параўнальна простую тэхналогію вырабу. Выкарыстоўваюцца ў спектраскапіі і квантавай электроніцы, плазмавай фотаметрыі і пірометрыі, у біялогіі і медыцыне, астрафізіцы і метэаралогіі.

Літ.: Борисевич Н. А., Хващевская Я. С. и Лапцевич И. Ф. Дисперсионные фильтры для инфракрасной области спектра, «Труды Ин-та физики и математики АН БССР», 1957, в. 2; Верещагин В. Г. и Борисевич Н. А. Исследование инфракрасных дисперсионных фильтров, «Журнал прикладной спектроскопии», 1968, т. 8, в. 4; Тж а. Новый тип дисперсионных фильтров для инфракрасной области спектра, там жа, 1970, т. 12, в. 1.


В. Р. Верашчагін. Мінск.

ДЫСПЕРСІЯ (лац. dispersio), мера рассейвання, г. зн. адхілення колькаснай характарыстыкі велічыні ад яе сярэдняга значэння.

У матэматычнай статыстыцы Д. $\sigma^2=[(x_1-\overline{x})^2+\ldots+(x_n-\overline{x})^2]:n$ — сярэдняе арыфметычнае з квадратаў адхіленняў велічынь $x_1, x_2, \ldots, x_n$ ад іх сярэдняга арыфметычнага $\overline{x}=(x_1+x_2+\ldots+x_n):n$. У *імавернасцей тэорыі* Д. выпадковай велічыні — сярэдняе значэнне (матэматычнае чаканне) квадрата адхілення выпадковай велічыні ад яе сярэдняга значэння.

ДЫСПЕРСІЯ ХВАЛІ, залежнасць паказчыка пераламлення ці фазавай скорасці распаўсюджвання монахраматычных хваляў ад частаты вагання.

З'ява частотнай Д. х. абумоўлена спазненнем водгуку асяроддзя пры ўзаемадзеянні яго з пераменным у часе полем хвалі. Канкрэтны выгляд дысперсійнай залежнасці для розных тыпаў хваляў



а і *б*

а) Дадатная дысперсія (заштрыхавана вобласць анамальнай дысперсіі); *б*) адмоўная дысперсія. n — паказчык пераламлення; ω — частата; ω_0 — частата хвалі, якая паглынаецца асяроддзем.

розны і можа быць у прынцыпе знойдзены на аснове дэталёвага квантава-механічнага даследавання працэсу ўзаемадзеяння поля хваляў з часцінкамі асяроддзя. Д. х. суправаджаецца паглынаннем, пры гэтым вызначана інтэгральная сувязь паміж паказчыкам пераламлення і каэфіцыентам паглынання як функцыямі частаты (суадносіны Крамерса — Кроніга). У оптыцы адрозніваюць нармальную і анамальную Д. х. Нармальная Д. х. адбываецца ўдалечыні ад частот паглынання дадзенага рэчыва, анамальная — у вобласці паглынання хваляў. Звычайна назіраецца т. зв. дадатная Д. х., у якой у нармальнай вобласці паказчык пераламлення расце з павелічэннем частаты, а ў анамальнай — спадае (рыс. *а*). Пры асаблівых умовах, калі значная частка атамаў рэчыва знаходзіцца ва ўзбуджаным стане, узнікае адмоўная Д. х.: па-за вобласцю паглынання з павелічэннем частаты паказчык пераламлення спадае, унутры — расце (рыс. *б*). З прычыны Д. х. хвалі розных частот на мяжы двух асяроддзяў пераламляюцца па-рознаму. На гэтай з'яве заснаваны адзін з спосабаў атрымання спектраў выпрамянення рэчыва. Адпаведныя прылады — прызмавыя спектрографы — шырока выкарыстоўваюцца ў навук. даследаваннях і ў заводскіх лабараторыях.

Літ.: Ландсберг Г. С. Оптика, 4 изд., М., 1957 (Общий курс физики, т. 3); Степанов Б. И. и Грибковский В. П. Введение в теорию люминесценции, Мн., 1963; Соколов А. А., Лоскутов Ю. М. и Терюв И. М. Квантовая механика, М., 1962.

В. А. Соўкі. Мінск.

ДЫСПЕРСНЫЯ СІСТЭМЫ, фізіка-хімічныя сістэмы, якія складаюцца з дробнараскрышаных часцінак (дысперсная фаза — ДФ), размеркаваных у пэўным асяроддзі (дысперсіонае асяроддзе — ДА). Кожная Д. с. шматфазная (у прасцейшым выпадку двухфазная; гл. *Гетэрагенная сістэма*) у адрозненне ад аднафазных сістэм — сапраўдных растворaў (гл. *Гамагенная сістэма*). З прычыны моцна развітай міжфазнай паверхні раздзелу Д. с. маюць лішак свабоднай энергіі, павышаную хімічную і адсарбцыйную актыўнасць і, як правіла, тэрмадынамічна нястойлівыя. Уласцівасці Д. с. вывучаюцца *калоіднай хіміяй*. Да Д. с. адносяцца: горныя пароды, глебы і грунты, туманы і воблакі, атм. ападкі (дождж, снег), касм. пыл, тканкі жывых арганізмаў і прадукты іх жыццядзейнасці.

Д. с. падзяляюцца на грубадысперсныя (памер часцінак большы за 1 *мкм*) і тонкадысперсныя (памер часцінак меншы за 1 *мкм* і нават за 0,1 *мкм*). Паводле агрэгатнага стану дзвюх фаз адрозніваюць *суспензіі* і дымы (цвёрдыя ДФ і адпаведна

вадкае ці газавае ДА); *эмульсіі* (кропелькі адной вадкасці ў другой); туманы (вадкая ДФ у газавым ДА; гл. *Аэразолі*); *пены* (ДФ — пузыры газу, ДА — вадкасць). Своеасаблівую групу Д. с. утвараюць керамічныя і шлакерамічныя целы, порыстыя целы (гл. *Сарбенты*) і шэраг іонаабменных смолаў. Паводле інтэнсіўнасці малекулярнага ўзаемадзеяння паміж фазамі Д. с. падзяляюцца на ліяфільныя з моцным узаемадзеяннем фаз (гуміарабік, бялкі, жэлацін) і ліпафобныя з слабым узаемадзеяннем фаз (тыповыя калоідныя растворы — ліязолі металаў, гідразолі ёдзістага серабра і інш.). Паводле структураванасці Д. с. адрозніваюць свабоднадысперсныя, у якіх часцінкі ДФ не звязаны ў адну суцэльную сетку, і звязанадысперсныя, якія маюць прасторавую сетку (напр., *гелі*). У залежнасці ад размеркавання часцінак ДФ у асяродзі структураваныя Д. с. дзеляць на трохмерныя (часцінкі ДФ размеркаваны ў аб'ёме ДА), двухмерныя і аднамерныя (часцінкі ДФ размешчаны адпаведна монамалекулярным ці адначасцінкавым слоем на паверхні цела).

Літ.: Гл. пры арт. *Калоідная хімія.*

У. С. Камароў. Мінск.

ДЫСПЕТЧАРЫЗА́ЦЫЯ, цэнтралізацыя аператыўнага кантролю і каардынацыя кіравання вытворчымі працэсамі з мэтай забяспечыць узгодненую работу асобных звенняў прадпрыемства ці групы прадпрыемстваў, накіраваную на дасягненне найвышэйшых тахн.-эканам. паказчыкаў, выкананне графікаў работы і вытворчай праграмы. Д.— комплекс арг.-тэхн. мерапрыемстваў, якія ахопліваюць аператыўнае планаванне, размеркаванне матэрыяльных і энерг. рэсурсаў, трансп. сродкаў, улік работы машын, механізмаў і інш.

Найпрасцейшая форма дыспетчарскай службы — двухбаковая тэлеф. сувязь дыспетчара з аб'ектамі, што дае магчымасць праводзіць цыркулярныя перадачы і дыспетчарскія парады, ажыццяўляць узаемны абмен інфармацыяй. Пры больш складанай форме дыспетчар мае прыстасаванні, якія «запамінаюць» становішча аб'екта пасля чарговага атрымання інфармацыі і аблягчаюць хуткае і правільнае прыняцце рашэнняў. Для гэтага выкарыстоўваюцца дыспетчарскія шчыты, на якіх размешчаны мнеманічныя схемы падкантрольных вытв. аб'ектаў, вымяральныя прылады, індыкатары сігналізацыі і г. д. Пры вялікіх аб'ёмах інфармацыі работа дыспетчара аблягчаецца інфармац. вылічальнымі машынамі, якія робяць аўтам. цыклічнае апытанне з адначасовым параўнаннем атрыманых паказчыкаў з намінальнымі велічынямі параметраў, што знаходзяцца ў памяці машыны (гл. *Аўтадыспетчар, Аўтаматызаваная сістэма кіравання вытворчасцю*). З расшырэннем задач Д. праводзіцца не толькі збор і апрацоўка інфармацыі, а таксама *дыстанцыйнае кіраванне* ці *тэлекіраванне*. Д.— адзін з найважнейшых сродкаў навук. арганізацыі *кіравання* ў прамысловасці, энергетыцы, буд-ве, с. гасп., на транспарце і інш. Гл. таксама *Тэхніка кіравання, Тэхнічная кібернетыка, Эканамічная кібернетыка.*

Літ.: Малов В. С. и Мешков В. К. Диспетчерские пункты энергетических систем, М.— Л., 1955; Буданцев Ю. Электронные помощники диспетчера, М., 1963; Бабенко А. С. Диспетчерская радиосвязь в объединениях и отделениях «Сельхозтехника», М., 1964; Технология и организация строительного производства, М., 1969; Вальденберг Ю. С., Белостоцкий А. А. и Абизов Р. М. Вычислительная техника на промышленном транспорте, М., 1970.

ДЫСПРАПАРЦЫЯНА́ЛЬНАСЦЬ, у капіталіст. эканоміцы — парушэнне неабходных суадносін паміж асобнымі галінамі і элементамі вытворчасці. Вынік прыватнакапіталіст. уласнасці на сродкі вытворчасці, *анархіі вытворчасці*, выяўленне *асноўнай супярэчнасці капіталізму.*

Д. існуе ў вытворчасці сродкаў вытворчасці і прадметаў спажывання, у прамысловасці і с. гасп., у развіцці асобных галін гасп., асабліва востра адчуваецца паміж узроўнем капіталіст. вытворчасці і плацежаздольным попытам працоўных. Адна з гал. прычын *эканамічных крызісаў* перавытворчасці. *Планаванне народнай гаспадаркі* сацыялістычн. краін выключае асновы Д., стварае ўмовы для хуткага пераадолення часовых дыспрапорцый.

ДЫСТАНЦЫЙНАЕ КІРАВА́ННЕ, метады і тэхнічныя сродкі кіравання машынамі, механізмамі, аўтаматыз. сістэмамі на адлегласці.

Бывае механічнае (кіраванне семафорамі на чыг. раз'ездах), пнеўматычнае (кіраванне тармазамі і дзвярыма ў аўтобусах, тралейбусах, электрапаязда́х), электрычнае (кіраванне рухавікамі, высакавольтавымі эл. выключальнікамі і інш.). Найб. пашырана электрычнае, калі ўключэнне і адключэнне выканаўчых механізмаў робіцца эл.-магн. прыстасаваннямі (*рэле, кантактарамі, электрамагнітамі* і інш.). Сістэма Д. к. складаецца са схем кіравання, блакіроўкі і сігналізацыі. Схемы кіравання выконваюць аперацыі кіравання; схемы блакіроўкі забяспечваюць неабходную паслядоўнасць аперацый кіравання; схема сігналізацыі паказвае становішча асобных элементаў абсталявання і сігналізуе пра пашкоджанні ў ланцугах. Сістэмы Д. к. высоказдзейныя і хуткадзейныя. Шырока ўжываюцца ў энергетыцы, хім. прамысловасці, машынабудаванні (пры стварэнні аўтам. ліній), на чыгуначным транспарце і інш. Гл. таксама *Тэлекіраванне.*

Літ.: Свечарник Д. В. Дистанционные передачи, 2 изд., М.— Л., 1966.

ДЫСТО́РСІЯ (лац. distorsio скрыўленне), адно са скажэнняў вобраза ў аптычных сістэмах. Узнікае з-за нераўнамернага павелічэння прадметаў аб'ектывам ад яго сярэдзіны да краёў; рэзкасць вобраза не парушаецца. Гл. таксама *Аберацыі аптычных сістэм.*

ДЫСТРАФІ́Я АДЫПОЗАГЕНІТА́ЛЬНАЯ, хвароба ад парушэння функцыі залоз унутранай сакрэцыі; характарызуецца атлусценнем і недаразвіццём палавых органаў. Гл. *Гіпофіза хваробы.*

ДЫСТРАФІ́Я ДЗІЦЯЧАЯ (*дыс...*+грэч. trophē харчаванне), хранічнае расстройства харчавання з парушэннем абмену рэчываў. Найчасцей бывае ў дзяцей да 1 году з пахуджэннем на 10—20% пры 1-й ступені, на 20—30% пры 2-й, больш як на 30% пры 3-й, пры штучным і мяшаным кармленні, ад пястачы яды, пры хваробах страваваль на-кішачнага тракту, дыятэзах, непаўнацэнным харчаванні, пясвоечасовым і няправільным дакорме на фоне інш. хвароб.

Д. дз. выклікае парушэнне дзейнасці ферментаў страваваль на-кішачнага тракту, працэсаў расшчаплення і ўсмоктвання харч. рэчываў, абмену будаўнічых і энергетычных працэсаў, дзейнасці нервовай сістэмы, крывазвароту; арганізм знясільваецца. Лячэнне: ліквідацыя прычын дыстрафіі, назначэнне рэчываў, якія павышаюць апетыт, пры Д. дз. 1-й і 2-й ступені — стымулявальныя сродкі. Прафілактыка: рацыянальнае кармленне, правільны догляд, рэжым, загартоўванне арганізма, папярджанне вострых і хранічных інфекцый і лячэнне інш. хвароб.

Літ.: Гл. пры арт. *Дыспепсія.*

ДЫСТРЫБУТЫ́ЎНАСЦЬ (ад лац. distributivus размеркавальны), размеркавальнасць, размеркавальны закон, уласцівасць множання, выражаная тоеснасцю $c(a+b)=ca+cb$. У больш агульным сэнсе гавораць пра Д. аператара $F(x)$ адносна некаторага дзеяння $x*y$ як пра ўласцівасць, выражаную роўнасцю $F(x*y)=F(x)*F(y)$.

ДЫСТРЫБУ́ЦЫЯ (размеркаванне), сукупнасць пазіцый, якія можа займаць моўная адзінка (фанема, марфема і г. д.) адносна іншых моўных адзінак у моўным патоку. Служыць асновай для вызначэння моўнай сістэмы.

Найб. групоўна дыстрыбутыўны аналіз распрацаваны ў *фаналогіі*, дзе вылучаюць: розныя адзінкі («к», «р», «б» у словах «кот, «рот», «бот») — гукі маюць адналькавую сукупнасць пазіцый і пры іх узаемнай замене мяняецца значэнне слова; факультатыўныя варыянты адзінкі (выбухны і фрыкат. «г», цвёрды і мяккі «з» у слове «газета») — гукі маюць адналькавую сукупнасць пазіцый, але пры іх узаемнай замене не мяняецца значэнне слова; камбінаторныя варыянты адной адзінкі («т» у слове «лодка», вымаўляецца «лотка»; у літ. мове звонкага «д» перад глухім бывае) — гукі маюць розную сукупнасць пазіцый, т. зв. дадатковую Д. На падставе камбінаторных магчымасцей моўных адзінак фармулюецца правіла суадносін Д. са зместам адзінак і іх варыянтамі: чым змястоўнейшая адзінка, тым вузейшая яе Д. (напр., суфікс «-ск-» больш абстрактны за суфікс «-аст-», таму ён і камбінуецца з большай колькасцю каранёвых марфем).

Літ.: Григорьев В. П. Что такое дистрибутивный анализ?, «Вопросы языкознания», 1959, № 1; Глисон Г. Введение в дескриптивную лингвистику, пер. с англ., М., 1959. *А. Я. Міхневіч.* Мінск.

ДЫСТЭ́Н, тое самае, што *кіляніт.*

ДЫСТЭ́РВЕГ (Diesterweg) Фрыдрых Адольф Вільгельм (29.10.1790—7.7.1866), нямецкі педагог-дэмакрат. Змагаўся супраць саслоўнай школы і апекі царквы над школай. Выкрываў палітыку прускай рэакцыі, накіраваную на выхаванне тупых і абмежаваных людзей, выступаў супраць ператварэння школы ў апору прускай манархіі. Асн. мэтай навучання лічыў развіццё разумовай актыўнасці вучняў, што знайшло адлюстраванне ў 33 дыдактычных правілах, сфармуляваных Д. Стварыў больш за 20 падручнікаў і метадычных дапаможнікаў. Аўтар вядомай працы «Кіраўніцтва да адукацыі нямецкіх настаўнікаў» (1835). У ГДР устаноўлены медаль імя Д., якім узнагароджваюцца засл. настаўнікі рэспублікі.

Тв.: Рус. пер.— Избр. педагогические соч., М., 1956.

Літ.: Пискунов А. И. Дидактические взгляды Адольфа Дистервега, «Советская педагогика», 1956, № 1. *У. С. Аранскі.* Масква.

ДЫСЦЫПЛІ́НА ПАРТЫ́ЙНАЯ, найважнейшая норма ўнутранага жыцця партыі, вызначаная Статутам партыі; адна з арганізацыйных асноў КПСС, марксісцка-ленінскіх камуніст. і рабочых партый. Сутнасць Д. п. сфармулявана У. І. Леніным: «Адзінства дзеянняў, свабода абмеркавання і крытыкі,— вось наша азначэнне» (Тв., т. 11, с. 290). Д. п. патрабуе ад камуніста абараняць *адзінства партыі*, актыўна змагацца за ажыццяўленне Праграмы, Статута, палітыкі партыі; падпарадкавання парт. меншасці большасці, безумоўнай абавязковасці рашэнняў вышэйшых парт. органаў для ніжэйшых. КПСС мае адну дысцыпліну для ўсіх камуністаў, незалежна ад пасады. Д. п. грунтуецца на свядомасці і добраахвотнасці падпарадкавання. Сродкам умацавання Д. п. з'яўляецца *дэмакратыя ўнутрыпартыйная.* Гл. таксама *Дэмакратычны цэнтралізм.*

Літ.: Ленін У. І. Аб рабочым адзінстве, Тв., т. 19 (Полн. собр. соч., т. 24); Ленін. Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме, Тв., т. 31 (там жа, т. 41); Ленін. Даклад аб адзінстве партыі і анарха-сіндыкалісцкім ухіле 16 сакавіка.— Заключнае слова па дакладу аб адзінстве партыі і анарха-сіндыкалісцкім ухіле 16 сакавіка [X з'езд РКП(б). 8—16 сак. 1921], Тв., т. 32 (там жа, т. 43); Статут КПСС, Мн., 1966; Ленинские принципы партийной работы в действии, Мн., 1967.

В. С. Кудрашоў. Мінск.

ДЫСЦЫПЛІ́НА ПРАЦЫ, абавязковае выкананне вызначанага працоўнага распарадку і адпаведных працоўных абавязкаў. Неабходная ўмова развіцця вытворчасці. У класава-антаганістычным грамадстве мае прымусовы эксплуататарскі характар. Пры сацыялізме заснавана на адносінах таварыскага супрацоўніцтва і ўзаемадапамогі свабодных ад эксплуатацыі работнікаў, спрыяе павышэнню прадукцыйнасці працы, матэрыяльнага дабрабыту і культ. ўзроўню працоўных. Абавязак сав. грамадзян строга захоўваць Д. п. замацаваны Канстытуцыяй СССР (арт. 130), канстытуцыямі саюзных рэспублік (Канстытуцыя БССР, арт. 105) і канкрэтызуецца правіламі ўнутранага прац. распарадку прадпрыемстваў і ўстаноў, інструкцыямі, статутамі аб дысцыпліне. Высокая Д. п. ў сацыяліст. краінах забяспечваецца свядомымі адносінамі да працы, метадам пераканання, матэрыяльнымі і маральнымі стымуламі. За парушэнне Д. п. прымаюцца меры дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння. Гл. таксама *Адказнасць.*

Літ.: Ленин В. И. О дисциплине, М., 1967; Основы законодательства Союза ССР и союзных республик о труде, М., 1970; Абрамова А. А. Дисциплина труда в СССР, М., 1969.

У. В. Шахоцька. Мінск.

ДЫЎРЭЦІ́Н, лякарства, сумесь тэабраміну патрыю з саліцылатам патрыю. Дробнакрышталічны белы парашок, добра растваральны ў вадзе. Мачагонны і сасударасшыральны сродак. Ужываецца ўнутр у парашках, таблетках, мікстурах супраць гіпертаніі, стэнакардыі, ацёкаў сардэчнага і нырачнага паходжання.

ДЫФЕНГІДРАМІ́Н, процізапаленчае і проціалергічнае лякарства, тое, што *дымедрол.*

ДЫФЕРЭНЦЫРАВА́ННЕ (у матэматыцы), аперацыя адшукання *вытворнай.* Гл. *Дыферэнцыяльнае вылічэнне.*

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́Л (лац. differentia рознасць) у матэматыцы, 1) адвольнае прырашчэнне незалежнага пераменнага. 2) Тая частка прырашчэння функцыі, якая лінейна залежыць ад прырашчэння аргумента. Абазначаецца сімвалам *d*. Для функцыі $y=f(x)$, $dx=\Delta x$, $dy=f'(x)dx$, дзе $f'(x)$ — вытворная $f(x)$. Гл. *Дыферэнцыяльнае вылічэнне.*

ДЫФЕРЭНЦЫЯ́Л (у тэхніцы), планетарны зубчасты механізм з дзвюма ступенямі свабоды, які перадае вярчэнне аднаго вала двум іншым валам пры рознай адноснай скорасці вярчэння апошніх.

Устаноўлены ў трансмісіі аўтамабіля ці колавага трактара Д. дае магчымасць вядучым колам пры паваротах вярцецца з рознымі скорасцямі. Ужываецца таксама ў лічыльна-рашальных прыладах, механізмах прыводу вінтоў турбавінтавых самалётаў і інш. На гусенічных машынах (трактары, танкі) ставяць падвойныя або складаныя Д., якімі карыстаюцца як механізмамі павароту.



Літ.: Фількевич В. Я. Дифференциальные механизмы, Л.,

1962; Кожинков В. И. и Иванов К. И. Расчет и конструирование зубчатых планетарных передач, 2 изд., М., 1970.

ДЫФЕРЭНЦЫЯЛЬНАЕ ВЫЛІЧЭННЕ, раздзел матэматыкі, які вывучае спосабы вылічэння вытворных і дыферэнцыялаў і іх выкарыстанне пры даследаванні змены функцый. Разам з *інтэгральным вылічэннем* складае курс матэм. аналізу. Стварэнне Д. в. як самастойнага раздзела матэматыкі належыць І. *Ньютану* і нім. матэматыку Г. *Лейбніцу* (17 ст.). Ньютан браў за аснову паняцце вытворнай як скорасці руху. Лейбніц зыходзіў з задач пабудовы датычных і вызначэння экстрэмуму. Тэрміналогія і абазначэнні, якімі карыстаюцца цяпер, належаць Лейбніцу.


Нехай $f(x)$ функцыя сапраўднага пераменнага x. Возьмем некаторае фіксаванае значэнне незалежнага пераменнага x, нададзім яму прырашчэнне Δx. Тады функцыя $f(x)$ атрымае адпаведнае прырашчэнне $\Delta y = f(x+\Delta x) - f(x)$. Граніца, калі яна існуе, адносіны $\frac{\Delta y}{\Delta x}$ пры $\Delta x \to 0$ наз. вытворнай ад функцыі $f(x)$ на аргументе x (абазначаецца y', $f'(x)$, $\frac{dy}{dx}$). Такім чынам, $y' = f'(x) = \frac{dy}{dx} = \lim\limits_{\Delta x \to 0} \frac{\Delta y}{\Delta x}$.


На рыс. *а* дадзены графік функцыі $y=f(x)$ у дэкартавых каардынатах, $M(x, y)$, $M_1(x+\Delta x, y+\Delta y)$ — пункты. Тады $MN = \Delta x$, $NM_1 = \Delta y$ і з трохвугольніка MNM_1 відаць, што адносіны прырашчэнняў $\frac{\Delta y}{\Delta x}$ будуць роўныя тангенсу $\angle M_1MN$, утворанаму сякучай, што праходзіць праз пункты M, M_1, з воссю абсцыс. Пры $\Delta x \to 0$ пункт M_1 у граніцным выпадку зліваецца з пунктам M і сякучая MM_1 ператвараецца ў датычную да графіка функцыі $y = f(x)$ у пункце M. Такім чынам, вытворная y' у некат. пункце роўна тангенсу вугла, утворанага датычнай да графіка функцыі $y = f(x)$. Ведаючы вытворную, можна пабудаваць датычную да графіка гэтай функцыі. Адшуканне рашэнняў гэтай задачы — адна з крыніц адкрыцця Д. в. Задача адшукання скорасці руху — другая крыніца адкрыцця Д. в. Дыферэнцыял незалежнага пераменнага (d) — адвольнае прырашчэнне гэтага пераменнага. Дыферэнцыял функцыі — адвольная вытворная функцыі на дыферэнцыял незалежнага пераменнага. Для функцыі $y = f(x)$, $dx = \Delta x = MN$, $dy = f'(x)\,dx = y'dx = MN \cdot \operatorname{tg}\alpha = NQ$, г. зн. дыферэнцыял функцыі — прырашчэнне ардынаты датычнай, у адрозненне ад прырашчэння функцыі $\Delta y = NM_1$, якое в'яўляецца прырашчэннем ардынаты крывой — графіка функцыі. Асн. задача Д. в.— вылічэнне вытворных і дыферэнцыялаў ад усіх вядомых элементарных функцый і арыфм. дзеянні над імі. Гэтая задача выконваецца з дапамогай табліцы формул і правілаў дыферэнцыравання. Функцыя, якая мае ў дадзеным пункце канечную вытворную, дыферэнцыруецца ў гэтым пункце. Усякая функцыя, якая дыферэнцыруецца, неперарыўная; адваротнае наогул не справядліва: неперарыўная функцыя можа не дыферэнцыравацца ні ў адным пункце. Вытворная функцыі такога функцыя, таму ад яе можна браць вытворныя. Так узнікаюць вытворныя вышэйшых парадкаў: другая, трэцяя і г. д. Абазначаюцца яны

$$y', y'', \ldots, y^{(n)}, \ldots \text{ ці } \frac{d^1y}{dx^1}, \frac{d^2y}{dx^2}, \ldots, \frac{d^ny}{dx^n} \ldots .$$

Вытворныя вышэйшых парадкаў выкарыстоўваюцца пры раскладанні функцый у ступенныя рады і ў інш. пытаннях. Метады Д. в. ўжываюцца для вывучання функцый некалькіх пераменных. У гэтым выпадку вызначаюцца частковыя вытворныя па кожным незалежным пераменным. Напр., для функцыі двюх незалежных пераменных $z = f(x, y)$ частковая вытворная па x роўная $\frac{\partial z}{\partial x} = z'_x = \lim\limits_{\Delta x \to 0} \frac{f(x+\Delta x, y) - f(x, y)}{\Delta x}$.

Аналагічна вызначаецца частковая вытворная па y. Частковыя вытворныя вылічваюцца паводле тых жа формул і правілаў, што і вытворныя ад функцыі аднаго незалежнага пераменнага, толькі пры





вылічэнні частковых вытворных па якім-н. пераменным усе астатнія незалежныя пераменныя трэба лічыць пастаяннымі. Частковы дыферэнцыял па якім-н. пераменным вызначаецца як здабытак частковай вытворнай на дыферэнцыял гэтага пераменнага. Поўны дыферэнцыял функцыі роўны суме ўсіх яе частковых дыферэнцыялаў; $dz = z'_x\,dx + z'_y\,dy$. З дапамогай вытворнай вызначаюць інтэрвалы ўзрастання і спадання функцый і заснаваную на гэтым пабудову графікаў. Калі $y' = \operatorname{tg}\alpha > 0$, то датычная утварае з воссю вострый вугал, графік функцыі павялічваецца, функцыя ўзрастае, калі $y' < 0$, графік апускаецца, функцыя спадае. Пункты, дзе ўзрастанне мяняецца на спаданне, наз. пунктамі максімуму функцыі; пункты, дзе спаданне мяняецца на ўзрастанне, наз. пунктамі мінімуму. Значэнні функцыі ў гэтых пунктах наз. адпаведна максімумам і мінімумам. Абодва ў сукупнасці наз. экстрэмумам (лакальны экстрэмум). Максімум большы за суседнія значэнні функцыі справа і злева, мінімум менш. Звычайна ў пунктах экстрэмуму датычная паралельная восі абсцыс і вытворная роўная нулю. Гэта неабходная ўмова экстрэмуму, але не дастатковая. Напр., у пункце M_3 (рыс. *б*) вытворная роўная нулю, аднак там няма ні максімуму, ні мінімуму. Дастатковая ўмова экстрэмуму — ператварэнне вытворнай у нуль з пераменай знака: у пунктах максімуму з «+» на «−», у пунктах мінімуму наадварот. Экстрэмум можа быць у пунктах, дзе вытворная не існуе (пункты злому і завастрэння крывой); M_5, M_6 — такія пункты. Пункты экстрэмуму вызначаюцца ў параўнанні з суседнімі значэннямі, калі ж параўноўваць усе значэнні функцыі, то некат. максімумы могуць быць меншыя за мінімумы, напр. у пунктах M_1 і M_6. Задача адшукання экстрэмуму была трэцяй крыніцай адкрыцця Д. в.

Літ.: Фихтенгольц Г. М. Основы математического анализа, т. 1, 6 изд., М., 1968; Смирнов В. И. Курс высшей математики, т. 1, М., 1967; Стройк Д. Я. Краткий очерк истории математики, 2 изд., пер. с нем., М., 1969.

Ф. Дз. Гахаў. Мінск.

ДЫФЕРЭНЦЫЯЛЬНАЯ ГЕАМЕТРЫЯ, раздзел геаметрыі, у якім геаметрычныя вобразы (крывыя і паверхні) вывучаюцца метадамі матэм. аналізу, у першую чаргу — *дыферэнцыяльнага вылічэння*. Аб'екты Д. г.— крывыя і паверхні эўклідавай прасторы, іх сямействы (г. зн. неперарыўныя сукупнасці крывых і паверхняў). У Д. г. перш-наперш даследуюцца ўласцівасці, характэрныя бясконечна малой частцы геам. вобраза,— т. зв. дыферэнцыяльныя ўласцівасці. У адрозненне ад элементарнай геаметрыі і аналітычнай геаметрыі, якія вывучаюць асобныя крывыя і паверхні ці спец. класы крывых і паверхняў, Д. г. разглядае крывыя і паверхні наогул.

Спачатку Д. г. вывучала дыферэнцыяльныя ўласцівасці геам. вобразаў звычайнай трохмернай прасторы, якія не залежаць ад становішча ў прасторы. Гэтая частка Д. г. наз. класічнай. Асобныя паняцці Д. г. сустракаюцца ў 2-й пал. 17 ст. у працах І. Ньютана, нім. матэматыка Г. Лейбніца і інш. Асновы тэорыі паверхняў закладзены ў канцы 18 ст. працамі Л. Эйлера і франц. матэматыка Г. Монжа. Вял. значэнне для развіцця Д. г. мелі працы нім. матэматыка К. Гаўса. Рус. матэматык К. М. Пятэрсон даў асн. ўраўненні паверхняў трохмернай прасторы Эўкліда і пабудаваў асновы класічнай тэорыі паверхняў. У 2-й пал. 19 ст. пасля прац рус. матэматыка М. І. Лабачэўскага, нім. матэматыка Б. Рымана і асаблівa ў пач. 20 ст. пасля адкрыцця тэорыі адноснасці галіна дастасаванняў і сам прадмет вывучэння Д. г. значна пашырыліся. Асн. кірункі сучаснай Д. г.: геаметрыя аднародных прастораў, у якіх двойчнае некат. сукупнасць (група) ператварэнняў (у класічнай Д. г.— група рухаў) і вывучаюцца тыя ўласцівасці геам. вобразаў, якія не мяняюцца пры пэўных ператварэннях; геаметрыя абагульненых прастораў, якія будуюцца на аснове дыферэнцыраванай разнастайнасці, што ўключае ў прыватны выпадак паняцці крывой і паверхні класічнай Д. г. Асобнае становішча займае «геаметрыя ў цэлым», створаная пераважна працамі сав. матэматыка А. Д. Аляксандрава. У ёй даследуюцца геам. вобразы, якія не могуць быць выражаны сродкамі дыферэнцыяльнага вылічэння. У ВССР вядуцца даследаванні на тэорыі аднародных і абагульненых прастораў.

Літ.: Погорелов А. В. Дифференциальная геометрия, 5 изд., М., 1969; его же, Внешняя геометрия выпуклых поверхностей, М., 1969; Норден А. П. Теория поверхностей, М., 1956; История отечественной математики, т. 3, Киев, 1968.

Н. І. Выдзерыкаў. Мінск.


ДЫФЕРЭНЦЫЯЛЬНАЯ РЭНТА, 1) пры капіталізме — лішак прыбавачнай вартасці над сярэднім прыбыткам, атрыманы пры больш высокай прадукцыйнасці працы на лепшай па ўрадлівасці ці месцы знаходжання да рынкаў збыту зямлі. Абумоўлена капіталіст. манаполіяй на зямлю як на аб'ект гаспадаркі. Ствараецца найміцнай працай сельскагаспадарчых рабочых.

Пакольку фонд усёй зямлі абмежаваны, і ў прыватнасці лепшай і сярэдняй па ўрадлівасці, грамадства вымушана выкарыстоўваць і горшыя землі, дзе затраты на адзінку прадукцыі большыя. Але грамадская *цана вытворчасці* вызначаецца выдаткамі вытворчасці на горшых землях; таму лепшыя землі даюць дадатковы прыбытак (звыш сярэдняга), які і ўтварае Д. р. Адрозніваюць Д. р. I і II. Дадатковы прыбытак, атрыманы пры выкарыстанні больш урадлівых ці больш бліскіх да рынку збыту зямельных участкаў, складае Д. р. I. Лішак над сярэднім прыбыткам, атрыманы пры больш прадукцыйных дадатковых укладаннях капіталу ў адзін і той жа участак зямлі,— Д. р. II. Ад Д. р. I яна адрозніваецца тым, што ўзнікае на аснове *інтэнсіфікацыі вытворчасці*.

2) Наконт Д. р. пры сацыялізме існуе некалькі пунктаў погляду. Адны эканамісты прычынай Д. р. лічаць калгасна-кааператыўную ўласнасць і звязаную з ёй манаполію с.-г. прадпрыемстваў на зямлю як на аб'ект гасп.; умовамі яе ўтварэння — розную ўрадлівасць зямель і іх месца знаходжання ад рынкаў збыту, напрыклад таварнай вытворчасці пры сацыялізме. С.-г. прадпрыемствы, якія маюць землі лепшыя па ўрадлівасці і бліжэй размешчаныя да рынкаў збыту, атрымліваюць больш прадукцыі ці затрачваюць менш выдаткаў на іх рэалізацыю. Але паколькі прадукцыя рэалізуецца па адзіных лакальных цэнах, гэтыя прадпрыемствы маюць дадатковы чысты даход — Д. р. I. Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, якія вядуць гасп. больш інтэнсіўна, таксама атрымліваюць чысты прыбытак, вышэйшы за сярэдні,— Д. р. II. Частка Д. р. ідзе на пашырэнне вытворчасці с.-г. прадпрыемстваў і матэрыяльнае стымуляванне работнікаў, частка (праз сістэму лакальных цэн і надаходны падатак) — у распараджэнне дзяржавы. Другія эканамісты прычынай Д. р. пры сацыялізме лічаць толькі манаполію на зямлю як на аб'ект гаспадаркі і таму прызнаюць Д. р. на ўсіх прадпрыемствах, якія гаспадараць на зямлі (калгасы, саўгасы, шахты і інш.). Некат. эканамісты адмаўляюць наяўнасць Д. р. пры сацыялізме, сцвярджаюць, што прызнанне Д. р. ідзе ад недасканаласці сучаснай дыферэнцыяцыі закупачных лакальных цэн. На іх думку, наяўнасць (побач з грамадскай) групавых, ці лакальных, вартасцей, якія складваюцца ў выніку розных глебава-кліматычных умоў вытворчасці, выключае аб'ектыўныя асновы ўтварэння Д. р.

Літ.: Гл. пры арт. *Зямельная рэнта.*

ДЫФЕРЭНЦЫЯЛЬНЫ МАНОМЕТР (дыфманометр), прылада для вызначэння розніцы ціскаў вадкіх ці газападобных рэчываў. Выкарыстоўваюцца пры вымярэннях скорасці і расходу газу, пары, вадкасці метадам дроселявання (гл. *Дросель*).



Паплаўковы гідрастатычны дыфманометр тыпу ДП (разрэз): *1* — мінусавы сасуд; *2* — вентылі; *3* — кромысел; *4* — паплавок; *5* — паплаўковы плюсавы сасуд; *6* — засцерагальны клапан.

Д. м. бываюць гідрастатычныя (адна- і двухтрубныя, паплаўковыя, кальцавыя) і механічныя (спружынавыя, мембранныя; сільфонныя). Гідрастатычныя (гл. рыс.) заснаваны на ўраўнаважванні перападу ціскаў слупком вадкасці; механічныя — на дэфармацыях спружыны, мембраны, сільфона (танкаценная трубка або камера з хваляпадобнымі складкамі — «гафрамі»). Асн. тэхн. характарыстыка Д. м.— велічыня перападу ціскаў і найб. статычны ціск, на які ён разлічаны. Дапушчальна вымярэнне ў 1—2%.

ДЫФЕРЭНЦЫЯЛЬНЫЯ ЎРАЎНЕННІ, ураўненні, якія змяшчаюць невядомыя функцыі, іх вытворныя любых парадкаў і незалежныя пераменныя. Д. ў. ўведзены ў матэматыку стваральнікамі вылічэння бясконечна малых І. Ньютанам і Г. Лейбніцам (17 ст.). Сістэматычнае вывучэнне Д. у. пачаў Л. Эйлер (18 ст.). У 19 ст. Д. ў. сталі самастойнай матэм. дысцыплінай. Заснавальнікі сучаснай тэорыі Д. у.— А. М. Ляпуноў, У. А. Сцяклоў і інш. У ВССР даследаванні па тэорыі Д. у. вядуцца ў Ін-це матэматыкі АН БССР і ў ВДУ над кіраўніцтвам акад. АН БССР М. П. Яругіна. Распрацоўка новых раздзелаў тэорыі Д. у., звязаных з тэорыяй кіравання сістэм, была пачата Н. А. Барбашыным і працягваецца яго вучнямі. У Мінску выдаецца ўсесаюзны час. *«Дифференциальные уравнения»*.

Змена масы m радыеактыўнага рэчыва з каэфіцыентам распаду k за прамежак часу dt выражаецца Д. у.

$$dm = k\,m\,dt. \qquad (1)$$

Тэмпература $U = U(x, y, z)$, што ўстанавілася ў кожным пункце (x, y, z) цела, на граніцы якога падтрымліваецца зададзены цеплавы рэжым, задавальняе Д. ў.

$$\frac{\partial^2 U}{\partial x^2}+\frac{\partial^2 U}{\partial y^2}+\frac{\partial^2 U}{\partial z^2}=0. \qquad (2)$$

Д. ў. віду (1) — звычайнае Д. ў. (змяшчае функцыю аднаго пераменнага), віду (2) — Д. ў. ў частковых вытворных (змяшчае вытворныя невядомай функцыі па розных пераменных). Парадак Д. ў. вызначаецца вытворнай самага высокага парадку ў гэтым ураўненні. Кожнае Д. ў. вызначае адразу цэлае сямейства рашэнняў, залежнае ад лікавых ці функцыянальных параметраў; яно выражае некаторы агульны закон, якому падпарадкоўваецца мноства канкрэтных працэсаў. Для вылучэння асобнага працэсу задаюць дадатковыя ўмовы, найчасцей — краявыя (пачатковыя і гранічныя). Для ураўнення (1) задаецца пачатковае значэнне — маса $m(0)=m_0$. Рашэнне (2) вызначаецца, напр., гранічнымі значэннямі — размеркаваннем тэмпературы на паверхні цела. Звычайнае лінейнае Д. ў. або сістэму гэтых Д. ў. увядзеннем дапаможнай функцыі можна запісаць у выглядзе $x'=P(t)x+\varphi(t)$, дзе P — матрыца каэфіцыентаў, φ — вектар свабодных членаў, $x=x(t)$ — вектар-функцыя. Калі $У$ — квадратычная матрыца, якая складаецца з незалежных рашэнняў адпаведнай адналрадной сістэмы ($\varphi\equiv 0$), а x^* — адно з рашэнняў прыведзенага Д. ў., тады ўсе яго рашэнні дае формула $x=x^*+Yc$, c — адвольны пастаянны вектар. У шэрагу выпадкаў, напр., пры пастаяннай P, пабудова x^* і $У$ зводзіцца да алгебраічных аперацый і інтэгравання. Існуюць і нелінейныя Д. ў., якія рашаюцца з дапамогай канечнага ліку прасцейшых аналітычных аперацый. Напр., калі $M_y=N_x$, тады ўсе рашэнні $M(x,y)dx+N(x,y)dy=0$ дае формула $\int M(x,y)dx+N(x,y)dy=c$ c — адвольная пастаянная. Калі Д. ў. зададзена з дапамогай аналітычных функцый, тады рашэнне выяўляецца таксама аналітычнай функцыяй, раскладаецца ў ступенны рад каля кожнага неасаблівага пункта і знаходзіцца метадам неакрэсленых каэфіцыентаў. Вызначэнне рашэння Д. ў. ці сістэмы Д. ў. $x'=f(t,x)$ з зададзенай пачатковай умовай $x(t_0)=x_0$ раўназначнае рашэнню *інтэгральных ураўненняў* тыпу:

$$x(t)=x_0+\int_{t_0}^{t} f[s,x(s)]ds. \qquad (3)$$

Калі f неперарыўная функцыя, то (3) мае хоць бы адно рашэнне. Калі, акрамя гэтага, неперарыўная f_x, то рашэнне (3) адзінае і яго можна знайсці з дапамогай *ітэрацый*. Метад ітэрацый разам з метадам раздзялення пераменных, з метадам малога параметра і інш. ўжываецца і пры рашэнні Д. ў. з частковымі вытворнымі. Прыбліжанае рашэнне Д. ў. атрымліваюць, замяняючы ў Д. у. вытворныя адносінамі прырашчэнняў і пераходзячы да ўраўнення ў канечных рознасцях. Тэорыя Д. ў. выкарыстоўваецца ў *варыяцыйным вылічэнні*, у тэорыі аптымальных працэсаў, у тэорыі кіравання рухам і ў большасці раздзелаў прыкладной матэматыкі. Вывучэнне *краявых задач* для Д. у. з частковымі вытворнымі — гал. частка матэматычнай фізікі.

Літ.: Еругин Н. П. Книга для чтения по общему курсу дифференциальных уравнений, Мн., 1970; Его ж. Линейные системы обыкновенных дифференциальных уравнений с периодическими и квазипериодическими коэффициентами, Мн., 1963; Барбашин Е. А. Введение в теорию устойчивости, М., 1967; Демидович Б. П. Лекции по математической теории устойчивости, М., 1967; Красовский Н. Н. Теория управления движением, М., 1968; Смирнов В. И. Курс высшей математики, т. 2, М., 1967; т. 3 (ч. 1—2), М., 1967—69; т. 4, М., 1958.

Ю. С. Багданаў. Мінск.

ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ ў біялогіі, дзяленне клетак і тканак раслінных і жывёльных арганізмаў, відаў на асобныя папуляцыі, а таксама дзяленне полу.

Д. клетак выклікае тканкавую спецыфічнасць; аб'яднанне падобных ці розных тканак у дыферэнцыяваныя часткі арганізма фарміруе органы і сістэмы органаў. Від складаецца з генет. папуляцый. Калі абмен генамі паміж асобінамі розных папуляцый аднаго віду спыняецца і адбор дзейнічае ў розных кірунках, адбываецца Д. папуляцый, у выніку чаго паяўляюцца разнавіднасці і віды. Д. полу — працэс развіцця, які вядзе да адрознення паміж мужчынскімі і жаночымі арганізмамі ў антагенезе, да паяўлення аднадомных і двухдомных раслін з аднаполымі і двухполымі кветкамі.

Літ.: Современные проблемы эволюционной теории, Л., 1967.

В. С. Анохіна. Мінск.

ДЫФРАКЦЫЙНАЯ РАШОТКА, аптычная прылада, якая мае вялікую колькасць паралельных шчылін або адбівальных люстраных палосак у непразрыстым экране.

Праходзячы праз Д. р. або адбіваючыся ад яе, святло раскладаецца на шэраг спектраў у выніку *дыфракцыі святла*. Д. р. з вялікай колькасцю штрыхоў (да 10 000 на 1 см) характарызуецца значнай *раздзяляльнай здольнасцю*. Уласцівасці Д. р. маюць крышталі, яны служаць прасторавай Д. р. для рэнтгенаўскіх прамянёў.

ДЫФРАКЦЫЯ СВЯТЛА (ад лац. diffractus разломаны), агінанне святлом перашкод, гэта значыць адхіленне ад законаў *геаметрычнай оптыкі*.

Адбываецца, калі святло праходзіць праз вузкія адтуліны ў непразрыстых экранах ці каля краёў непразрыстых целаў. Карціна Д. с. вызначаецца суадносінамі паміж памерамі перашкоды ці адтуліны і даўжынёй хвалі святла. Гл. таксама *Дыфракцыя хваляў*, *Дыфракцыя часцінак*.

ДЫФРАКЦЫЯ ХВАЛЯЎ, з'ява, якая назіраецца, калі хвалі праходзяць праз адтуліны ў перашкодах (або каля краёў апошніх), і заключаецца ў агінанні хвалямі перашкод.

Адбываецца пры распаўсюджванні гуку, святла, радыёхваляў, рэнтгенаўскіх прамянёў, што пацвярджае хвалевую прыроду гэтых працэсаў. Гл. таксама *Дыфракцыя святла*, *Дыфракцыя часцінак*.

ДЫФРАКЦЫЯ ЧАСЦІНАК, рассеянне патоку мікрачасцінак (электронаў, пратонаў, атамаў і малекул) крышталямі або малекуламі вадкасцей і газаў з утварэннем чаргаваных максімумаў і мінімумаў у інтэнсіўнасці рассеяных мікрачасцінак (гл. рыс.).



Электронаграма, атрыманая пры рассеянні пучка электронаў парашком PbS.

Максімумы і мінімумы ў дыфракцыйнай карціне размяркоўваюцца ў адпаведнасці з унутр. будовай рассейвальнага асяроддзя. Д. ч. аналагічная *дыфракцыі святла* і пацвярджае квантавую прыроду мікрачасцінак (гл. *Квантавая механіка*). Выкарыстоўваецца пры даследаванні паверхні цвёрдых целаў, будовы крышталяў і складаных малекул.

А. І. Болсун. Мінск.

ДЫФТОНГ (грэч. diphthongos двухгалосны), спалучэнне двух галосных гукаў у адным складзе. Д., у якім складаўтваральны другі кампанент, называецца ўзыходным: франц. nuit. Калі складаўтваральны першы кампанент, Д. называецца сыходным: нам. Auge. У бел. мове ёсць дыфтонгі («ўо» і «іе») толькі ў дыялектах на Пд Беларусі. Вымаўляюцца ў закрытых складах замест «о» і «е», а таксама замест «е», што паходзіць з «ѣ»: «куо̄нь», «сі̯е̄м», «лі̯е̄та» («конь», «сем», «лета»).

В. І. Рабкевіч. Мінск.

ДЫФТЭРЫЯ (грэч. diphthérion скурка, плеўка), інфекцыйная хвароба з фібрынозным (плеўкавым) запаленнем і агульнай інтаксікацыяй. Бывае пераважна ў дзяцей. Да 1917 на Беларусі Д. была адной з найб. частых прычын дзіцячай смяротнасці.

Узбуджальнік Д. адкрыты нам. бактэрыёлагамі Э. Клебсам і Ф. Лёфлерам у 1883. Крыніца інфекцыі — хворыя на Д. і бацыланосьбіты. Перадаецца паветрана-кропельным шляхам. Адрозніваюць Д. зева, носа, гартані, полавых органаў (у дзяўчынак), вачэй, ран. Найчасцей бывае Д. зева (лакалізаваная, пашыраная і таксічная). Прыкметы яе: пасля інкубацыйнага перыяду (ад 2 да 14 дзён) т-ра цела 39 °С, боль пры глытанні, пачырваненне, шэра-белыя плеўкі на слізістай абалонцы. Ускладненні: рэзкае звужэнне прасвету гартані (стэноз), міякардыт, поліневрыт, нефроз.

Лячэнне: шпіталізацыя, процідыфтэрыйная сываратка, пры крупе — аперацыйнае лячэнне. Прафілактыка: прышчэпкі супраць Д. коклюшна-дыфтэрыйна-слупняковай (КДС) вакцынай. У БССР бываюць адзінкавыя выпадкі Д.

Літ.: Руководство по микробиологической диагностике инфекционных болезней, М., 1964.

У. М. Баран. Мінск.

ДЫФУЗІЙНЫ АПАРАТ (дыфузар, экстрактар), апарат для здабывання растваральных рэчываў з раздробненай сыравіны метадам *дыфузіі*.

Адрозніваюць Д. а. перыяд. і бесперапыннага дзеяння; апошнія больш дасканалыя. Найб. пашыраны на цукр. з-дах для атрымання цукр. соку з буракоў. Д. а. перыяд. дзеяння — батарэя з 12—16 герметычна закрытых сасудаў, у якой сок, атрыманы ў першым сасудзе, паступова пераходзіць у наступныя, запоўненыя свежай бурачнай «стружкай», дзе ён робіцца больш канцэнтраваны. У Д. а. бесперапыннага дзеяння бурачная стружка і вада, у якую дыфундзіруе цукар, бесперапынна рухаюцца адна адной насустрач (прынцып супрацьцёку). Д. а. бесперапыннага дзеяння падзяляюцца на вертыкальныя, нахіленыя і гарызантальныя; ратацыйныя, стужкавыя і шнэкавыя. Прадукцыйнасць Д. а. 1000—1800 *т* буракоў за суткі. Выкарыстоўваюцца ў хім. прамысловасці, дубільна-экстрактнай і харч. вытворчасці.

Літ.: Юрина Т. Л. (сост.). Непрерывно действующие диффузионные аппараты. Обзор, Кишинев, 1966; Литвинов Е. В. Диффузионные установки непрерывного действия на зарубежных сахарных заводах. Обзор, М., 1960.

ДЫФУЗІЯ (лац. diffusio распаўсюджванне), самаадвольны працэс пераносу рэчыва, накіраваны на ўстанаўленне раўнаважнага размеркавання канцэнтрацыі ў газах, вадкасцях і цвёрдых целах у выніку хаатычнага цеплавога руху атамаў, малекул ці ўзважаных часцінак.

Д.— неабарачальны працэс, заўсёды накіраваны ад слоя з вышэйшай канцэнтрацыяй да слоя з нізейшай канцэнтрацыяй. Адрозніваюць: самадыфузію — выраўноўванне ізатопнага саставу ў аднакампанентнай сістэме; тэрмадыфузію і электрадыфузію — Д. ў сістэме, дзе дзейнічаюць знешнія сілы, напр. адпаведна градыент т-ры або эл. патэнцыялу; узыходную Д.— Д., звязаную з паяўнасцю ў аб'ёме цвёрдага цела градыента ўнутр. напружанняў. Колькасць перанесенага рэчыва пры Д. праз плошчу, парцыяльная градыенту канцэнтрацыі, плошчы, роўны колькасці перанесенага рэчыва, калі градыент канцэнтрацыі, плошча і час роўныя адзінцы. Дыфузійныя працэсы выкарыстоўваюцца ў шматлікіх галінах тэхнікі і прамысловасці (кінетыка працэсаў акіслення і сорбцыі, эфектыўнасць каталітычных рэакцый, растварэнне палімерных матэрыялаў, крышталізацыя, дубленне скур, азатаванне сталяў, фарбаванне). Д.— адзін з асн. фактараў жыццядзейнасці расліннага і жывёльнага свету, з ёю звязана ўсмоктванне і паглынанне пажыўных рэчываў, выдзяленне прадуктаў абмену і інш.

Літ.: Бродский А. И. Химия изотопов, 2 изд., М., 1957; Френкель Я. И. Кинетическая теория жидкостей, Собр. избр. трудов, т. 3, М.—Л., 1959; Зайт В. Диффузия в металлах, пер. с нем., М., 1958.

У. С. Камароў. Мінск.

ДЫХАГАМІЯ (грэч. dicha паасобку+gámos шлюб), неадначасовае выспяванне ў кветках тычынак і песцікаў. Апісана рус. батанікам А. Ц. Болатавым. Бывае ў двухполых і аднаполых кветках, у аднадомных і двухдомных раслін. Адрозніваюць больш ранняе выспяванне тычынак — пратандрыю (уласцівае амаль усім раслінам сям. складанакветных, парасонавых, варсянковых і інш.) і больш ранняе выспяванне песцікаў — пратагінію (у раслін сям. крыжакветных, ружакветных і інш.). Д.— прыстасаванне да перакрыжаванага апылення.

ДЫХАННЕ, сукупнасць працэсаў акіслення арганічных рэчываў у арганізмах з вызваленнем энергіі, неабходнай ім для жыцця. Пры Д. з навакольнага асяроддзя паглынаецца кісларод і выдаляюцца вуглякіслы газ і вада. Аснова Д.— спажыванне кіслароду жывымі клеткамі, якое суправаджаецца рэакцыямі дэгідрагенізацыі з пераносам вадароду ад арганічных рэчываў (субстратаў Д.) на кісларод з утварэннем вады. Гэтыя рэакцыі ідуць у спец. структурах клеткі — мітахондрыях. Д. ажыццяўляецца пераважна за кошт акіслення вугляводаў. Схема акіслення глюкозы пры Д.: $C_6H_{12}O_6+6O_2\rightarrow 6CO_2+6H_2O+674$ *ккал*. Д. мае 2 этапы: пачатковы (анаэробны), які адбываецца па тыпе *гліколізу* (цукры ў анаэробных умовах распадаюцца да піравінаградная к-ты) і канчатковы (аэробны), пры якім піравінаградная к-та акісляецца да CO_2 і H_2O (цыкл Крэбса). Д. з удзелам кіслароду паветра як больш дасканалая форма ўзнікла на пэўнай ступені эвалюцыі раслін (паяўленне ў паветры кіслароду ў працэсе фотасінтэзу).

У аднаклетачных і некат. шматклетачных жывёл ажыццяўляецца паверхняй цела, больш высокаарганізаваныя маюць спец. *дыхання органы*. У пазваночных жывёл і чалавека ёсць 3 узаемазвязаныя этапы Д.: вонкавае, перанос газаў крывёю і тканкавае Д. Абмен газаў паміж вонкавым асяроддзем і крывёю лёгачных капілярaў і жабраў — вонкавае Д. Яно забяспечваецца дыхальнымі рухамі (удыхам, выдыхам), колькасць якіх за 1 *мін* у стане спакою ў чалавека 16—20, у каня 8—16, пацука больш за 100, мышы каля 200. Пры адным спакойным удыху чалавека ў лёгкія паступае каля 500 *мл* паветра (дыхальнае паветра); столькі ж яго і выдыхаецца. Дыхальны аб'ём паветра, памножаны на колькасць дыханняў за 1 *мін*, дае велічыню мінутнай лёгачнай вентыляцыі (у дарослых людзей 4—8 *л*). Жыццёвая ёмістасць лёгкіх складаецца з дыхальнага, дадатковага (максімальны ўдых) і запаснога (максімальнае выдыханне) аб'ёму паветра. Прычына абмену паветра ў альвеолах лёгкіх — рознасць парцыяльнага ціску. Парцыяльны ціск O_2 у альвеолах 100—110 *мм рт. сл.*, у вянознай крыві 40—50, а CO_2 адпаведна 40, 46 *мм рт. сл.* За 1 *мін* у стане спакою з лёгкіх у кроў паваходзіць каля 300 *мл* O_2, а выводзіцца з крыві CO_2 250 *мл*. Адносіны аб'ёму выдаленага CO_2 да аб'ёму спажытага за гэты час O_2 наз. дыхальным каэфіцыентам. Рэгуляцыя Д. ў чалавека і пазваночных жывёл адбываецца дыхальным цэнтрам. Перанос газаў крывёю (O_2 ад альвеолаў да ўсіх органаў і тканак і CO_2 у адваротным напрамку) складае т. зв. дыхальную функцыю крыві (гл. *Гемаглабін*, *Кроў*). Аснова тканкавага Д.— акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі. Пры іх вызваляецца энергія, якая ідзе на аднаўленне жывога рэчыва, рост і развіццё тканак, скарачэнне мышцаў, сакрэцыю залоз і інш. Абмен газаў паміж клеткамі тканак і крывёю адбываецца шляхам дыфузіі ў вы-

ніку таго, што парцыяльнае напружанне O_2 у тканках ніжэйшае, чым у крыві, а CO_2, наадварот, вышэйшае. Унутрыклетачныя акісляльныя працэсы у тканках адбываюцца з удзелам дыхальных ферментаў, што было адначасна А. М. Бахам (1897). Сав. вучоны У. А. Энгельгарт і інш. паказалі сувязь паміж працэсамі акіслення і нератварэння фосфарнай к-ты ў клетках, у выніку чаго вызваляецца энергія, якая выкарыстоўваецца арганізмам.

Літ.: Турков а Н. С. Дыхание растений, М., 1963; Рубин Б. А. и Ладыгина М. Е. Энзимология и биология дыхания растений, М., 1966; Маршак М. Е. Регуляция дыхания у человека, М., 1961 (бібліягр.); Бах А. Н. Собрание трудов по химии и биохимии, М., 1950; Костычев С. П. Избранные труды по физиологии и биохимии микроорганизмов, т. 1—2, М., 1956.

Л. У. Гаеўскі, І. У. Гуняжэнка. Мінск.

ДЫХАННЯ ОРГАНЫ, органы, якія забяспечваюць абмен газаў паміж арганізмамі жывёл, чалавека і вонкавым асяроддзем. У ніжэйшых аэробных (гл. *Аэробы*) арганізмаў (прасцейшыя, губкі, кішачнаполасцевыя і інш.), а таксама ў анаэробных (гл. *Анаэробы*) паразітаў (смактуны, стужкавыя і круглыя чэрві) газаабмен ажыццяўляецца ўсёй паверхняй цела. У высокаарганізаваных шматклетачных жывёл, большасць клетак якіх не сутыкаецца з вонкавым асяроддзем, паглынанне O_2 і выдаленне CO_2 ідзе ў спец. органах. Арганізмы, якія выкарыстоўваюць O_2 атмасфернага паветра, маюць *лёгкія* (земнаводныя, паўзуны, птушкі, млекакормячыя жывёлы, чалавек, а таксама дваякадыхальныя і кісцяпёрыя рыбы) або *трахеі* (большасць насякомых). У арганізмаў, што паглынаюць O_2, раствораны ў вадзе, развіваюцца *жабры* (у рыб, некат. членістаногіх, усіх малюскаў, вышэйшых чарвей, лічынак некат. земнаводных). Гл. таксама *Дыханне.*

Літ.: Привес М. Г., Лысенков Н. К. и Бушкович В. И. Анатомия человека, 6 изд., Л., 1968.

ДЫХРАІЗМ (ад грэч. di двойчы+chróa колер), двухколернасць, больш дакладна плеахраізм — шматколернасць, уласцівасць анізатропных целаў (напр., крышталяў) выяўляць розную афарбоўку ў белым святле ў залежнасці ад таго, у якім кірунку праз іх глядзяць. Д. абумоўлены неадналькавым паглынаннем святла крышталем у розных кірунках.

ДЫЦГЕН (Dietzgen) Іосіф (9.12.1828, Бланкенберге — 15.4.1888), нямецкі рабочы, філосаф-самавучка, які самастойна прыйшоў да дыялектычнага матэрыялізму. Працаваў у гарбарнай майстэрні. Пасля рэвалюцыі 1848, у якой удзельнічаў, эміграваў у Амерыку, потым у Расію (1863—69). У 1869 вярнуўся на радзіму, уступіў у с.-д. партыю і ўдзельнічаў у арганізацыі нім. секцыі 1-га Інтэрнацыянала. У 1884—88 жыў у Амерыцы, быў адным з кіраўнікоў амер. рабочага руху. Філас. погляды Д. развіваліся пад уплывам Л. Феербаха, а потым К. Маркса і Ф. Энгельса.



Але дыялектыка ў Д. не склалася ў навук. сістэму, што вяло яго да ўступак рэлятывізму і вульгарнаму матэрыялізму. Памылковыя палажэнні Д. выкарыстоўвалі махісты ў барацьбе супраць дыялект. матэрыялізму.

Тв.: Избр. философские сочинения, М., 1941; Письма И. Дицгена к К. Марксу и Ф. Энгельсу, «Вопросы философии», 1958, № 3.

Літ.: Ленін У. І. Да дваццаціпяцігоддзя смерці Іосіфа Дыцгена, Тв., т. 19 (Поли. собр. соч., т. 23); Волкова В. В. Иосиф Дицген, М., 1961.

ДЫЦУКРЫДЫ (біёзы), $C_{12}H_{22}O_{11}$, група вугляводаў, малекула якіх мае два астаткі простых цукраў *(монацукрыдаў)*, злучаных гліказіднай сувяззю. У прыродзе пашыраны: *лактоза* (малочны цукар) — у малацэ чалавека і жывёл, *цукроза* — у цукр. бураках, цукр. трыснягу, бярозе, клёне і інш., трэгалоза — у грыбах, водарасцях, некат. вышэйшых раслінах; мальтоза ўтвараецца пры ферментатыўным распадзе крухмалу і глікагену; цэлабіёза ўваходзіць у састаў клятчаткі і інш. Каштоўныя харч. і смакавыя рэчывы. Выкарыстоўваюцца ў мікрабіялогіі і фармакалогіі.

Д.— крышталічныя рэчывы, салодкія на смак. Добра растваральныя ў вадзе, дрэнна ў арган. растваральніках. Адрозніваюцца ў валентнасці ад астаткаў монацукрыдаў, якія ўваходзяць у іх састаў *(глюкозы, фруктозы)* і ад формы гліказідных сувязей, напр., цукроза — α-глюказіда-1,2-β-фруктазід, а мальтоза — α-глюказіда-1,4-глюкоза. Падзяляюцца на адноўленчыя (мальтоза, лактоза, цэлабіёза) і неадноўленчыя (цукроза, трэгалоза). Злучэннем 1-й групы ўласцівыя рэакцыі монацукрыдаў. Пры акісленні Д. ўтвараюць альдонавыя к-ты, пры адноўленні — спірты. Лёгка гідралізуюцца разбаўленымі к-тамі на монацукрыды; устойлівыя да шчолачаў. Гідроліз Д. у арганізме чалавека і жывёл адбываецца з удзелам ферментаў гідралазаў і фасфарылазаў (апошнія каталізуюць гідроліз з дабаўленнем не вады, а артафосфарнай к-ты). Гл. таксама *Вугляводы.*

Літ.: Фердман Д. Л. Биохимия, 3 изд., М., 1966; Гребинский С. Биохимия растений, Львов, 1967.

М. М. Масны. Мінск.

ДЫЭЛЕКТРЫКІ (англ. dielectric, назва ўведзена М. *Фарадэем*), рэчывы, якія практычна не праводзяць электрычнага току. Да Д. належаць газы, многія чыстыя вадкасці (напр., вада, трансфарматарнае масла) і некат. інш. матэрыялы (буцітыл, слюда, шкло, каўчук, эбаніт). Д. ўжываюцца ў многіх электратэхнічных і радыётэхнічных прыладах. Гл. таксама *Ізаляцыйныя матэрыялы.*

Вельмі малая электраправоднасць Д. абумоўлена тым, што эл. зарады, якія ўваходзяць у састаў Д., не могуць свабодна рухацца ўнутры Д. Адсутнасць свабодных зарадаў у Д. тлумачыцца на аснове квантавамеханічных уяўленняў (гл. *Зонная тэорыя*). Пры адсутнасці знешняга эл. поля сумарнае эл. поле самога Д. роўнае нулю. Ад дзеяння знешняга эл. поля зарады ўнутры Д. зрушваюцца з стану раўнавагі, у выніку чаго Д. паляризуецца. Паляризацыя вядзе да паяўлення эл. зарадаў процілеглага знака на процілеглых паверхнях Д. Існуе група Д., т. зв. сегнетаэлектрыкі (гл. *Сегнетаэлектрычнасць*), якія могуць мець паляризацыю і без дзеяння знешняга эл. поля (сегнетава соль, танат барыю і інш.). У моцных эл. палях напружанасцю каля 10^5 *в/м* электраправоднасць рэзка павялічваецца і адбываецца эл. прабой, які суправаджаецца электрычным разрадам, механічнымі і хімічнымі зменамі Д.

Літ.: Сканави Г. И. Физика диэлектриков (область слабых полей), М.— Л., 1949; яго ж. (область сильных полей), М.— Л., 1958; Физика диэлектриков (область сильных полей), М., 1958; Богородицкий Н. П. и др. Теория диэлектриков, М.— Л., 1965.

С. П. Капельян. Мінск.

ДЫЭЛЕКТРЫЧНАЯ АНТЭНА, гл. *Антэна.*

ДЫЭЛЕКТРЫЧНАЯ ПРАНІКАЛЬНАСЦЬ абсалютная, адносіны вектара электрычнага зруху да вектара напружанасці электрычнага поля ў пэўным асяроддзі. Вымяраецца ў фарадах на метр (*ф/м*). Адносная Д. п.— адносіны абсалютнай Д. п. рэчыва да абсалютнай Д. п. вакууму.

Д. п.— адна з асн. характарыстык *дыэлектрыкаў.* Яна паказвае, у колькі разоў меншае сіла ўзаемадзеяння эл. зарадаў пры пераносе іх з вакууму ў пэўнае асяроддзе. Адносная Д. п. для газападобных дыэлектрыкаў роўная 1,002÷1,006, для вадкіх дыэлектрыкаў 1,8÷81, для сегнетаэлектрыкаў 200÷50 000. Звычайна Д. п. дыэлектрыка вызначаецца пры вымярэнні ёмістасці кандэнсатара, запоўненага гэтым дыэлектрыкам.

ДЫЭЛЕКТРЫЧНЫ ЎЗМАЦНЯЛЬНІК, узмацняльнік электрычных ваганняў, заснаваны на выкарыстанні сегнетакерамічнага кандэнсатара з нелінейнымі ўласцівасцямі (варыконда).

Нелінейнасць выяўляецца ў значнай змене ёмістасці пры змене прыкладзенага напружання. Змена ёмістасці кандэнсатара Д. ў. ў сваю чаргу выклікае змену напружання выходнага сігналу. На нізкіх частотах узмацненне, якое дае Д. ў., дасягае вял. значэнняў, напр., для гукавых частот адна ступень Д. ў. дае ўзмацненне па магутнасці больш за 100. На высокіх частотах (парадку некалькіх мегагерц) узмацненне меншае да 10 і ніжэй. Ужываецца ў прыстасаваннях і прыладах аўтаматыкі, тэлемеханікі, сігналізацыі і інш.

Літ.: Плужников В. М. Диэлектрические усилители, М., 1969.

ДЫЭНЦЭФАЛЬНЫ СІНДРОМ (гіпаталамічны сіндром), комплекс сімптомаў, абумоўленых паражэннем глыбінных аддзелаў галаўнога мозгу (гіпаталамуса, гіпофіза). Бывае ад інфекцый (грыпу, рэўматызму, бруцэлёзу, туберкулёзу, сіфілісу), траўмаў і пухлін галаўнога мозгу, хранічных хвароб печані, нырак, страўніка і інш. Прыкметы: парушэнне сну, тэмпературнай рэгуляцыі, водна-салявога абмену, дзейнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы і залоз унутр. сакрэцыі — гіпофіза, полавых, шчытападобнай, надніркавых (гл. *Гіпофіза хваробы*). Лячэнне: антыбіётыкі, сульфаніламіды, гармоны, сардэчныя, заспакаяльныя і псіхаміметычныя сродкі, вітаміны, дыэта, рэнтгенатэрапія.

Літ.: Грашенков Н. И. Гипоталамус, его роль в физиологии и патологии, М., 1964 (бібліягр.).

Д. А. Маркаў. Мінск.

ДЫЭТА (грэч. diaita спосаб жыцця), рэжым рацыянальнага харчавання чалавека. Гл. *Лячэбнае харчаванне.*

ДЫЯБАЗ, поўнакрышталічная палеатыпная магматычная горная парода з групы габра-базальту. Складзеная з плагіяклазаў і аўгіту, з прымессю магнетыту, ільменіту, другасных мінералаў, радзей алівіну, кварцу. Колер цёмна-зялёны, зеленавата-шэры. Формы залягання — дайкі, сілы, невялікія лакаліты. Выкарыстоўваецца на брук, шчабёнку і як сыравіна на каменнае ліццё. На Беларусі трапляецца ў породах крышталічнага фундаменту (Жыткавічы, Мікашэвічы, Шчучын).

ДЫЯБЕТ НЕЦУКРОВЫ, парушэнне водна-салявога абмену ў арганізме ад пашкоджання гіпофіза і прамежк. мозгу. Гл. *Гіпофіза хваробы.*

ДЫЯБЕТ ЦУКРОВЫ (цукровае мочавыдзяленне, цукровая хвароба), хвароба абмену рэчываў ад нястачы ў арганізме інсуліну. Бывае ад парушэння дзейнасці лангенгарсавых астраўкоў падстраўнікавай залозы.

Спрыяюць Д. ц. спадчынная схільнасць, пераяданне (атлусценне), псіхічныя траўмы, арган. пашкоджанні цэнтр. нервовай сістэмы, інфекцыйныя хваробы (грып, ангіна, тыф). Ад парушэння вугляводнага абмену пры Д. ц. павялічваецца колькасць цукру ў крыві (гіперглікемія), ён паяўляецца ў мачы (гліказурыя); ад парушэння тлушчавага абмену павялічваецца колькасць кетонавых целаў у крыві, яны выдаляюцца з мачой; ад парушэння бялковага абмену выдаляюцца аміяк і амінакіслоты; ад парушэння мінеральна-воднага абмену паяўляецца смага і павялічваецца колькасць мачы (поліурыя). Адрозніваюць прадыябет, скрыты дыябет і выразны Д. ц. (лёгкай, сярэдняй і цяжкай формы). Прыкметы: павышаны апетыт, смага, выдзяленне вял. колькасці мачы, нахудзенне, агульная слабасць. Ускладненні Д. ц.: кома, поліневрыт, гламерулясклероз, рэтынапатыя, катаракта, гангрэна. Лячэнне: дыэта, інсулін, прэпараты сульфанілмачавіны ўнутр. Прафілактыка: у сем'ях з спадчыннай схільнасцю да Д. ц. дыэта, бедная на вугляводы і тлушчы.

Літ.: Многотомное руководство по внутренним болезням, т. 7, Л., 1966; Генес С. Г. Сахарный диабет, 5 изд., М., 1963 (бібліягр.); Основы эндокринологии, 2 изд., Мн., 1967; Диабет, пер. с англ., М., 1964 (бібліягр.).

Л. В. Лапцёнак. Мінск.

ДЫЯГЕНЕЗ (ад грэч. diagénesis пераражэнне), сукупнасць працэсаў нератварэння рыхлых адкладаў на дне водных басейнаў у асадкавыя горныя пароды. Пры Д. састаўныя часткі адкладаў узаемадзейнічаюць паміж сабою і асяроддзем. Гэта вызначаецца іх неракрышталізацыяй, растварэннем няўстойлівых кампанентаў, развіццём працэсаў акіслення і адноўлення, дэгідратацыяй, уяднікненнем мінер. новаўтварэнняў і інш.

Літ.: Лукашев К. И. и Лукашев В. К. Геохимические поиски элементов в зоне гипергенеза, кн. 1, Мн., 1967, с. 273—278; Диагенез и катагенез осадочных образований, М., 1971.


ДЫЯГНАСТЫЧНЫЯ СРОДКІ (грэч. diagnōsis распазнаванне, вызначэнне), рэчывы для распазнавання хвароб.

Адна група — рэчывы, якія затрымліваюць рэнтгенаўскія прамяні (рэнтгенакантрастныя) для вызначэння змен у анатамічнай будове нырак і мочавыдзяляльных шляхоў (сергазін, трыётраст, кардыятраст), сэрца і сасудаў (кардыятраст, трыятраст), жоўцевага пузыра і жоўцевых шляхоў (білітраст, білігност, ёдагност), трахеі, бронхаў, маткі і фалопіевых труб (ёдалінол, прапіёдан), страўніка і кішэчніка (барыя сульфат). Другая група — Д. с. для вызначэння функцыянальнай актыўнасці органаў: страўніка (кафеін, гістамін, атрапін, скапаламін, плаціфілін), нырак (індыгакармін, метыленавы сіні), печані і жоўцевыводных шляхоў (натрыю бензаат, магнію сульфат), шчытападобнай залозы (ёд радыеактыўны) і вока (гоматрапін, плаціфілін). Трэцяя група — алергены для распазнавання хваробы на рэакцыях, якія выяўляюць павышаную адчувальнасць арганізма (гл. *Алергічныя метады даследаванняў*).

Літ.: Машковский М. Д. Лекарственные средства, ч. 2, М., 1967.

М. В. Караблёў. Гродна.

ДЫЯГРАМА СТАНУ (грэч. diagramma рысунак, фігура), дыяграма раўнавагі, фазавая дыяграма, графічнае адлюстраванне залежнасці паміж параметрамі стану фізіка-хімічнай сістэмы (т-ра, ціск) ці паміж імі і некат. іншымі яе параметрамі, у прыватнасці саставам, структурай ці канцэнтрацыяй.



Зычайна Д. с. паказвае сувязь паміж т-рай, ціскам і саставам сістэмы, калі ў ёй больш чым адзін кампанент. Д. с. аднакампанентнай

сістэмы паказвае сувязь паміж ціскам і т-рай. Д. с. розных сістэм будуюцца на аснове эксперыменту метадамі *фізіка-хімічнага аналізу*. На рыс. паказана Д. с. вады: на гарыз. восі адкладзены т-ры (у градусах стоградуснай шкалы), а на вертыкальнай — ціск (у *н/м²*). У т. зв. трайным пункце *O* (т-ра 0,0076 °С і ціск 610 *н/м²*) сістэма складаецца з лёду, вады і пары, якія знаходзяцца ў раўнавазе. Лінія *OB* адлюстроўвае стан раўнавагі лёду з парай; *OG* — вады з парай; *OD* — лёду з вадой. У т. зв. палях, якія знаходзяцца паміж лініямі *BO*, *OG* і *OD*, сістэма складаецца з H_2O толькі ў адным агрэгатным стане (лёд, вада, пара).

Літ.: Палатник Л. С. и Ландау А. И. Фазовые равновесия в многокомпонентных системах, Харьков, 1961; Райнз Ф. Диаграммы фазового равновесия в металлургии, пер. с англ., М., 1960. *Ю. А. Фінаеў.* Мінск.

ДЫЯКЛЕТЫЯН Гай Аўрэлій Валерый (Gaius Aurelius Valerius Diocletianus; 243—паміж 313 і 316), рымскі імператар [284—305]. Сын вольнаадпушчаніка. Устанавіў т. зв. дамінат — неабмежаваную, абсалютную імператарскую ўладу. Ажыццявіў шэраг паліт., ваен. і адм. рэформаў. Падзяліў імперыю на 101 правінцыю (12 акруг-дыяцэзаў), у правінцыях аддзяліў ваен. ўладу ад цывільнай, павялічыў армію, выдаў эдыкт аб макс. цэнах, вызначыў адзіны падымельны падатак, расшырыў правы буйных землеўладальнікаў. Задушыў паўстанне сялян, калонаў і рабоў у Галіі (т. зв. багаўдаў), праследаваў хрысціян (у 303—304 выдаў 4 эдыкты).

ДЫЯКРЫТЫЧНЫЯ ЗНАКІ, дадатковыя знакі ў алфавіце для больш дакладнай перадачы гукавой сістэмы мовы.

У слав. графіцы з'явіліся пад уплывам старагрэч. пісьма. Самыя характэрныя старабел. пісьменнасці — камора, паерык, цітла. Д. з. ёсць ва ўсіх алфавітах на лац. графічнай аснове, акрамя англ., і ва ўсіх алфавітах народаў СССР, створаных на аснове рус. графікі. У спалучэнні з асн. літарамі абазначаюць і варыянты гукаў (франц. è, é, ê; ням. ö, ü) і розныя гукі (польск. ł, ć, ś; літ. ł, š). У бел. алфавіце з Д. з. ўжываюцца літары «ё», «й», «ў»; адмысловае графічнае значэнне мае апостраф (').

ДЫЯЛА Тэлі Бубакар (н. 1925, Гвінея), дзярж. і грамадскі дзеяч Гвінеі. Атрымаў юрыд. адукацыю ў Парыжскім ун-це. У 1954 суддзя ў г. Тыс (каля Дакара), у 1955 нач. канцылярыі вярхоўнага камісара Францыі ў Франц. Зах. Афрыцы (ФЗА). З 1955 уваходзіў у Вялікі савет ФЗА, быў яго ген. сакратаром, у 1959—63 прадстаўнік Гвінейскай Рэспублікі ў ААН і адначасова пасол Гвінеі ў ЗША. З чэрв. 1964 ген. сакратар *Арганізацыі афрыканскага адзінства*.

ДЫЯЛЕКТ (грэч. dialektos гаворка), група або некалькі груп мясцовых гаворак пэўнае мовы, якія аб'ядноўваюцца агульнасцю ў фанетыцы, граматычным ладзе і слоўніку і гэтым вылучаюцца сярод іншых гаворак. Дыялект з'яўляецца самай вялікаю і складанаю тэр. разнавіднасцю дыялектнай мовы, характэрнай насельніцтву пэўнай нацыі або народнасці. Дыялектная мова можа быць адзінствам двух ці больш дыялектаў (беларуская, руская — 2, украінская — 3, літоўская — больш як 20, славенская — больш як 40) або можа аб'ядноўваць толькі гаворкі (румынская). Разам з агульнанародпай *літаратурнаю мовай* складае сістэму нац. мовы і мовы народнасці (бел. мова, рус. мова і інш.) або з'яўляецца ўвасабленнем яе (цыганская мова). Акрамя тэрытарыяльных, вылучаюцца таксама Д. сацыяльныя (гл. *Арго*). З развіццём нацый дыялекты на пачатку з'яўляюцца базаю фарміравання агульнанац. літ. мовы. Астаючыся найважнейшаю крыніцаю ўзбагачэння літ. мовы, пад яе ўплывам паступова нівеліруюцца і згладжваюцца. Д.— жывая з'ява і ў наш час.

Узнікненне Д. звязана з утварэннем плямёнаў. Племянныя Д. складаліся з родавых гавораў. Аб'яднанне роднасных плямёнаў і фарміраванне стараж. народаў выклікала ўзаемадзеянне блізкіх племянных Д. і ператварэнне іх у разнавіднасці стараж. народных моў. Падобны працэс адбываўся пры аб'яднанні шматлікіх усходнеслав. плямёнаў у старажытнарускую народнасць. Вядомыя цяпер тэрытарыяльныя Д., у т. л. і беларускія, склаліся і развілі сваю адметнасць пераважна ў перыяд феадалізму. Д. адмяжоўваюцца адзін ад аднаго пучкамі ізаглосаў — перапляценнямі межаў тэр. пашырэння сваіх адметных асаблівасцей. Гаворкі ўнутры гэтага перапляцення ізаглосаў суседніх Д. называюцца пераходнымі, напр., спрэднебел. гаворкі на сутыку паўн.-ўсх. і паўд.-зах. Д. бел. мовы (гл. карту на ўкл.). Гл. таксама *Беларуская мова*.

Літ.: Гл. пры арт. *Дыялекталогія* і *Лінгвістычная геаграфія*. *А. А. Крывіцкі.* Мінск.

ДЫЯЛЕКТАЛОГІЯ (грэч. dialektos гаворка+...*логія*), раздзел моваазнаўства, у якім вывучаецца дыялектная мова, яе тэрытарыяльныя разнавіднасці *(дыялекты, гаворкі)*, іх асаблівасці і гісторыя. Тэорыя ўзнікнення і развіцця дыялектных моў і іх структуры складае змест агульнай дыялекталогіі, якая ўваходзіць у агульнае моваазнаўства. Структуру і гісторыю канкрэтнай дыялектнай мовы вывучае звычайна Д. асобных моў нацый і народнасцей (Д. бел. мовы) або групы сваяцкіх моў (Д. ўсходнеславянскіх моў).

У асобны раздзел моваазнаўства Д. вылучылася на пачатку 19 ст. У 1-й пал. 19 ст. ў фальклорна-этнагр. запісах пачалі назбіравацца фактычныя звесткі пра жывую мову беларусаў. З'яўляюцца таксама невялікія апісанні ле рэгіянальных асаблівасцей (К. Ф. Калайдовіч, Ф. Галатузаў, П. Шастакоў, Н. Анімеле). Лінгвістычнае даследаванне фальклорна-этнагр. матэрыялаў і жывое мовы беларусаў пачынаецца ў 2-й пал. 19 ст. (І. І. Насовіч, М. А. Коласаў, К. Апель, І. І. Нядзёшаў). Бел. Д. як навука заснавана Я. Ф. Карскім у канцы 19 — пач. 20 ст. У гэты час пытанні бел. Д. асвятляюцца таксама ў працах па гісторыі і Д. рус. мовы (А. І. Сабалеўскі, А. А. Шахматаў, В. А. Багародзіцкі і інш.). У залежнасці ад аспекту даследавання Д. падзяляецца на апісальную і гістарычную. У пач. 20 ст. з Д. ў спец. галіну вылучылася *лінгвістычная геаграфія*, якая на Беларусі плённа развіваецца з 20-х г. (П. А. Бузук). У гэты час шырока збіраецца дыялектная лексіка бел. мовы (І. К. Бялькевіч, М. І. Каспяровіч, С. М. Некрашэвіч, М. В. Шатэрнік і інш.). На Беларусі праца па лінгвагеаграфіі, апісанні гаворак і даследаванні іх асаблівасцей, а таксама па дыялектнай лексікаграфіі дасягнула найб. поспехаў пасля Вял. Айч. вайны: выдадзены «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (ч. 1—2, 1963), «Нарысы па беларускай дыялекталогіі» (1964), «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак» (1968, кн. картаў 1969) і інш.

Літ.: Недешев И. И. Исторический обзор важнейших звуковых и морфологических особенностей белорусских говоров, «Русский филологический вестник», 1884, т. 12, № 3—4; Карский Е. Ф. Белорусы. Введение в изучение белорусского языка и народной словесности, Вильно, 1904; яго ж. Белорусы. Язык белорусского народа, в. 1—2/3, М., 1955—56; Соболевский А. И. Опыт русской диалектологии. Наречия великорусское и белорусское, СПб., 1897; Расторгуев П. А. Северско-белорусский говор, Л., 1927; яго ж. Говоры на территории Смоленщины, М., 1960; Вінава Э. Д. і Мяцельская Е. С. Беларуская дыялекталогія, Мн., 1969; Moszyński K. Polesie wschodnie, Warszawa, 1928; Tarnacki J. Studia porównawcze nad geografią wyrazów (Polesie — Mazowsze), Warszawa, 1939; Kuraszkiewicz W. Zarys dialektologii wschodniesłowiańskiej z wyborem tekstów gwarowych, Warszawa, 1954. *А. А. Крывіцкі.* Мінск.

ДЫЯЛЕКТЫКА (ад грэч. dialektikē майстэрства весці гутарку), у марксісцкай філасофіі навука пра найбольш агульныя законы руху і развіцця прыроды, грамадства і мыслення, тэорыя і метад пазнання і рэвалюц. пераўтварэння рэчаіснасці. Змест матэрыялістычнай Д. ў яе аснoўных прынцыпах (усеагульнай сувязі і развіцці) і законах (гл. *Адзінства і барацьба процілегласцей, Пераход колькасных змен у якасныя, Адмаўленне адмаўлення*), якія дапаўняюцца і канкрэтызуюцца законамі, выражанымі ў суадносінах катэгорый Д. (гл. *З'ява і сутнасць, Змест і форма, Вынік і прычына, Выпадковасць і неабходнасць, Магчымасць і рэчаіснасць*). Законы Д. з'яўляюцца адначасова і законамі быцця і законамі мыслення, пазнання. Таму ў марксісцкай філасофіі Д. супадае або тоесная з тэорыяй пазнання і логікай (гл. *Дыялектычная логіка*). Д. процілеглая *метафізіцы*.

У ст.-грэч. філасофіі пад Д. разумелі пераважна майстэрства разважаць, весці гутарку, палеміку, выяўляючы супярэчнасці ў мысленні аб прадметах і ў самых прадметах. Геракліт разумеў Д. як узаемасувязь прадметаў, іх зменлівасць, пераход у процілеглы стан. Платон называў Д. метадам пазнання ідэй з іх супярэчнасцямі адзінага і шматлікага, вечнага і мінучага, нязменнага і зменлівага. Старажытнагрэч. філосафы, паводле слоў Ф. Энгельса, былі «прыроджанымі дыялектыкамі». У эпоху Адраджэння элементы Д. былі ў Мікалая Кузанскага і Дж. Бруна, якія адрадзілі, у прыватнасці, ідэю Геракліта пра супадзенне процілегласцей. У матэрыяліст. філасофіі новага часу панавала метафізіка. Аднак асобныя элементы Д. сустракаліся ў некаторых філосафаў: Р. Дэкарта (ідэя паходжання сусветаў з першапачатковых элементаў), Б. Спінозы (дыялект. падыход да праблемы свабоды і неабходнасці), Д. Дзідро (здагадка пра эвалюцыю жывых істот). Новы этап у развіцці Д. звязаны з імёнамі ням. філосафаў-ідэалістаў 18—19 ст. (Кант, Фіхтэ, Шэлінг, Гегель). Гегель упершыню сфармуляваў асн. законы Д., стварыў сістэму іх катэгорый. Але ён ідэалістычна сказіў Д., разглядаў яе як форму развіцця містычнай абсалютнай ідэі. Рускія рэвалюц. дэмакраты 19 ст. (А. І. Герцэн, В. Р. Бялінскі, М. Г. Чарнышэўскі, М. А. Дабралюбаў) спалучылі Д. і матэрыялізм у тлумачэнні з'яў прыроды, ставілі Д. на службу рэвалюц. практыкі, разглядаюцца яе як алгебру рэвалюцыі, але аставаліся ідэалістамі ў тлумачэнні грамадскіх з'яў.

Сапраўды навуковая матэрыялістычная Д. створана К. Марксам і Ф. Энгельсам і развіта У. І. Леніным. Яны выкарысталі дыялект. ідэі папярэдняй філасофіі, і пераважна Гегеля, якую матэрыялістычна перапрацавалі. Матэрыялістычнае разуменне гісторыі дазволіла Марксу і Энгельсу спалучыць Д. і матэрыялізм да канца, стварыць якасна новую філасофію — *дыялектычны матэрыялізм*. У гэтай філасофіі Д. рэчаў, прадметаў аб'ектыўнага свету з'яўляецца першаснай, а Д. ідэй, паняццяў — другаснай, вытворнай, выступае як адлюстраванне Д. рэчаў. Галоўнае ў Д. яе ядро — вучэнне пра ўнутр. супярэчнасці як крыніцы ўсякага развіцця. Гэта дае магчымасць зразумець развіццё як скачкападобны пераход колькасных змен у якасныя, як адмаўленне старога новым з захаваннем станоўчага зместу папярэдніх ступеняў, як спіралепадобны працэс адмаўлення са зваротам да некат. уласцівасцей выходных ступеняў на новай, больш высокай аснове. Ленін раскрыў найб. важныя элементы Д., паказаў яе як складаную, дыферэнцыраваную і ў той жа час цэласную навуку, у якой усе бакі непарыўна звязаныя. Матэрыяліст. Д., яе законы і катэгорыі пастаянна развіваюцца, удасканальваюцца. З паяўленнем новых абагульняльных тэорый і метадаў (кібернетыка, тэорыя інфармацыі, агульная тэорыя сістэм, сістэмна-структурны аналіз і інш.) Д. астаецца актуальнай, найб. агульнай тэорыяй будовы, функцыянавання і развіцця матэрыяльных і ідэальных сістэм, навукай аб працэсах развіцця, агульных формах і метадах іх пазнання. Д. абагульняе новыя тэорыі і метады і на гэтай аснове канкрэтызуе і ўзбагачае сістэму сваіх законаў і катэгорый. Матэрыяліст. Д. па сваёй сутнасці рэвалюцыйная і крытычная. У руках рабочага класа і яго партыі яна не толькі сродак пазнання, але і зброя рэвалюц. пераўтварэння свету. Паказваючы гістар. характар усіх формаў грамадскага жыцця, яна патрабуе не згладжваць процілегласці, а вырашаць іх рэвалюц. шляхам. Таму Д. выклікае страх у буржуазіі і яе апалагетаў. Бурж. ідэолагі імкнуцца абвергнуць матэрыяліст. Д., аднак развіццё навукі і грамад. жыцця ўсё больш даказвае дыялект. характар рэчаіснасці.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; яго ж. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; яго ж. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); яго ж. Карл Маркс, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (там жа, т. 29); О «Философских тетрадях» В. И. Ленина, М., 1959; Александров Г. Ф., Горбач В. И. и Ковалгин В. М. Развитие В. И. Лениным марксистского учения о законах диалектики, Мн., 1960; Горбач В. И. О видах противоречий, Мн., 1964; Ленин об элементах диалектики, М., 1965; Диалектический материализм как методология естественнонаучного познания, Мн., 1965; Морозов В. Д. Проблема развития в философии и естествознании, Мн., 1969; Широканов Д. И. Взаимосвязь категорий диалектики, Мн., 1969; Евменов Л. Ф. Диалектика и революция, Мн., 1969. *В. Дз. Марозаў.* Мінск.

ДЫЯЛЕКТЫЧНАЯ ЛОГІКА, навука пра *дыялектыку* як метад. Пра логіку аб'ектыўнай рэчаіснасці гаворыць у сэнсе аб'ектыўных заканамернасцей свету. Гэта т. зв. аб'ектыўная дыялектыка. Яе адлюстраванне — суб'ектыўная дыялектыка — навука пра найб. агульныя законы развіцця прыроды, грамадства і мыслення. Усякія веды, у якой бы форме яны ні былі выражаны — у форме паняццяў або іх сістэм,— выкарыстоўваюцца ў сваёй метадалагічнай функцыі. З ужывання тэорый і нават іх асобных элементаў узнікаюць метады. «Нават фармальная логіка,— пісаў Ф. Энгельс,— прадстаўляе сабой перш за ўсё метад для адшукання новых вынікаў, для пераходу ад вядомага да невядомага; тое ж самае, толькі ў значна больш высокім сэнсе прадстаўляе сабой дыялектыка...» (Анты-Дзюрынг, Мн., 1952, с. 118). Выкарыстанне дыялектыкі ў

пазнанні і пераўтварэнні рэчаіснасці ўзбройвае нас дыялект. метадам. Паколькі ён здольны служыць усеагульным метадам пазнання і пераўтварэння свету, пастолькі тэорыя гэтага метаду набывае значэнне спец. навукі, якой і з'яўляецца Д. л. У функцыі дыялектыкі як метаду найважнейшае значэнне мае ўменне яе прымяняць. Таму У. І. Ленін ставіў перад сав. філосафамі спец. задачу паказаць дыялектыку, «якую Маркс практычна прымяняў і ў сваім «Капітале» і ў сваіх гістарычных і палітычных работах...» (Тв., т. 33, с. 207). У марксізме дыялектыка, тэорыя пазнання і логіка супадаюць, або знаходзяцца ў адзінстве, бо дыялектыка — навука пра законы аб'ектыўнага свету, уключаючы пазнанне, якое супадае з гэтым светам па змесце, і яна ж як тэорыя пазнання выступае ў ролі метаду, тэорыяй якога ў сваю чаргу становіцца Д. л. «Калі Магх не пакінуў «Логікі» (з вялікай літары), то ён пакінуў «логіку «Капітала»... У «Капітале» прыменена да адной навукі логіка, дыялектыка і тэорыя пазнання матэрыялізму [не патрэбна 3-х слоў, гэта адно і тое ж]...» (Ленін У. І. Тв., т. 38, с. 307). Гэтае адзінства не выключае спецыфічных асаблівасцей Д. л. як навукі, бо калі дыялектыка як агульная тэорыя развіцця і сувязі з'яў свету адлюстроўвае аб'ектыўны свет, а дыялектыка як тэорыя пазнання абгрунтоўвае яго пазнавальнасць, то Д. л., якая даследуе дыялектыку як метад, паказвае, як формы мыслення — паняцці, катэгорыі, законы і інш.— служаць пазнанню. Д. л. вывучае законы і катэгорыі дыялектыкі (гл. *Адзінства і барацьба процілегласцей, Пераход колькасных змен у якасныя, Адмаўленне адмаўлення, З'ява і сутнасць, Змест і форма, Супярэчнасць*), але з свайго спецыфічнага боку, як метадалагічныя прынцыпы. Паколькі мысленне выяўляецца ў мове (натуральнай і ў штучных сістэмах знакаў), логіка ўключае таксама даследаванне моўных сродкаў. Гал. задача Д. л.— вызначыць шляхі і метады адлюстравання руху і развіцця рэчаў у разумовай тэарэт. форме. Яна паказвае, як рух і развіццё, унутраная процілегласць з'яў, іх якасныя змены, пераходы адных рэчаў у другія выяўляюцца ў зменлівых, рухомых, гібкіх паняццях і інш. формах мыслення. Калі паняцці перухомыя, адзначаў У. І. Ленін, «яны не адлюстроўваюць жывога жыцця» (Тв., т. 38, с. 243). Д. л. не паглынае традыц. і матэм. фармальнай логікі (гл. *Фармальная логіка, Матэматычная логіка*), *лагічнай семантыкі, семіётыкі* і інш. навук, якія даследуюць формы і сродкі мыслення і пазнання, а ўзаемадзейнічае з імі і ўзбройвае іх агульным метадам. Не падмяняючы інш. навук пра мысленне, Д. л. ўдзельнічае ў разглядзе праблем, якія вывучаюцца імі, але падыходзіць да іх з пункту погляду ўзнікнення і развіцця формаў мыслення, высвятлення ролі знакаў і знакавых сістэм у адлюстраванні рэчаіснасці, узаемаадносін агульных і прыватных метадаў пазнання, суадносін абвяржэння і доказу, ісцінных і няісцінных ведаў і інш.

Дыялектыку як логіку пачалі спецыяльна вывучаць прадстаўнікі нямецкай класічнай філасофіі (Кант, Гегель і інш.). Да гэтага дыялектыка была вядомая альбо ў выглядзе абмежаванага метаду вядзення спрэчак, як у Сакрата і Платона, альбо ў форме агульнай канцэпцыі развіцця, як у Геракліта. У выглядзе асобных элементаў яна ўжывалася ў пазнанні ў асноўным стыхійна і не даследавалася як метад або логіка. Кант упершыню ўжыў тэрмін Д. л. Ён шукаў супярэчнасцей, што, на яго думку, непазбежна заблытваюць розум, які хоча даслужыць абсалютнага сінтэзу ведаў, сваю трактоўку логікі называў дыялектыкай. Крытыкуючы Канта за суб'ектывізм, Гегель, паводле К. Маркса, даў усеабдымную і свядомую абмалёўку ўсеагульных формаў дыялектычнага руху (гл. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 19). Гегель называў сваю сістэму дыялект. ідэалізму логікай, разглядаючы агульныя законы дыялектыкі і як законы развіцця аб'ектыўнай ідэі і як законы пазнання. Асабліва вял. ўвагу Гегель аддаваў даследаванню паняццяў як ступеняў аб'ектыўнай ідэі, дзе найбольш выяўляюцца дзве інш. ступені ідэі — быццё і сутнасць. «Гегель геніяльна ўгледаў дыялектыку рэчаў (з'яў, свету, прыроды) у дыялектыцы паняццяў» (Ленін У. І. Тв., т. 38, с. 183). Рашуча пераадольваючы містыку Гегеля і захоўваючы рацыянальнае з яго метаду, К. Маркс і Ф. Энгельс распрацавалі матэрыяліст. дыялектыку, у т. л. і Д. л. Погляды Маркса і Энгельса на дыялектыку атрымалі далейшае развіццё ў працах У. І. Леніна, які сфармуляваў тэзіс пра адзінства, або супадзенне дыялектыкі, тэорыі пазнання і логікі і гэтым самым вылучыў асн. прынцыпы Д. л., вызначыў яе задачы як навукі. Той факт, што фармальная логіка (як і інш. навукі) да марксізма знаходзілася пад уплывам метафізікі і яе законы часта тлумачыліся метафізічна (гл., напр., *Тоеснасці закон*), служыць часам падставай для ўзаемапроціпастаўлення фармальнай логікі, як быццам бы ў прынцыпе метафізічнай, і Д. л. Аднак, разглядаючы ўзаемаадносіны фармальнай логікі і Д. л., трэба ўлічваць, што: 1) фармальная логіка мае свае задачы па вывучэнні мыслення і з'яўляецца прыватнай лагічнай навукай, тады як Д. л. ў адносінах да фармальнай логікі — навука агульная; 2) пазнанне на сучасным узроўні не можа ажыццяўляцца без дыялектыка-матэрыялістычнай метадалогіі (становішча не змяняецца ў прынцыпе ад таго, ведаюць ці не ведаюць даследчыкі дыялектыку, ужываюць ці не ўжываюць яе свядома; калі не ведаюць і не ўжываюць дыялектыкі, яна прабівае сабе шлях стыхійна), і таму фармальная логіка як навука вызваляецца ад метафізікі і яе развіццё ажыццяўляецца на дыялект. аснове; 3) пры распрацоўцы фармальнай логікі, як і кожнай прыватнай навукі, няправільна рабіць якія-н. абмежаванні ва ўжыванні дыялектыкі, таксама як і на Д. л. не распаўсюджваюцца абмежаванні ў выкарыстанні ёю дасягненняў фармальнай логікі і інш. навук пра мысленне. Дыялектыка як логіка ахоплівае, або прапавае ўсё вучэнне пра мысленне і пазнанне так, як у вывучэнні прыроды дыялектыка прапавае ўсё прыродазнаўства, а ў вывучэнні грамадскага жыцця яна неад'емна «ўваходзіць» ва ўсе навукі пра грамадства.

Літ.: Ленін У. І. Яшчэ раз аб прафсаюзах, аб бягучым моманце і аб памылках Троцкага і Бухарына, Тв., т. 32, с. 69—78 (Поли. собр. соч., т. 42, с. 286—296); яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38, с. 74, 179, 209—210, 306—307, 349—352 (там жа, т. 29, с. 80, 174, 204, 298—301, 316—321); Диалектика и логика научного познания, М., 1966; Конин И. В. Философские идеи В. И. Ленина и логика, М., 1969; Горский Д. П. Проблемы общей методологии наук и диалектической логики, М., 1966; Нарский И. С. Проблемы противоречия в диалектической логике, М., 1969; Пузиков П. Д. Анализ и синтез — от мысли к вещи, Мн., 1969; гл. таксама літ. пры арт. *Дыялектыка*.

П. Дз. Пузікаў. Мінск.

ДЫЯЛЕКТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛІЗМ, філасофія марксізма, якая, як навука, даследуе найбольш агульныя законы развіцця прыроды, грамадства і мыслення. У ім арганічна спалучаецца дыялект. падыход да з'яў аб'ектыўнага свету з іх матэрыяліст. тлумачэннем. Д. м.— метад пазнання і рэвалюц. пераўтварэння свету. Створаны К. Марксам і Ф. Энгельсам і развіты У. І. Леніным.

Як сістэмная частка марксізма і яго філас. аснова ўзнік у 40-я г. 19 ст. на глебе адпаведных сац.-эканам. умоў, ідэйных крыніц і навук. перадумоў, якія спарадзілі марксізм цалкам (гл. *Марксізм-ленінізм*). Фарміраваўся ў барацьбе з ідэалізмам і метафізікай, апіраючыся на ўсё каштоўнае і прагрэсіўнае, што было створана чалавечай думкай да яго. Непасрэднай тэарэт. крыніцай Д. м. была класічная нямецкая філасофія. Маркс і Энгельс пераадолелі суб'ектыўны метафіз. матэрыялізм Феербаха і матэрыялістычна перапрацавалі ідэаліст. дыялектыку Гегеля. Як ідэолагі рабочага класа, абагульнілі вопыт барацьбы пралетарыяту супраць буржуазіі і поспех прыродазнаўства свайго часу, стварыўшы якасна новы від філасофіі.

Узнікненне Д. м. было рэвалюц. пераваротам у гісторыі чалавечай думкі. Ён адрозніваецца ад папярэдняй філасофіі класавымі карэннямі, аб'ектам і метадам пазнання і грамадскай роляй. Д. м. ахоплівае адзіным разуменнем усю складаную тканіну прыроды, чалавечага грамадства і мыслення, матэрыялістычна вырашае *асноўнае пытанне філасофіі*, лічыць, што Сусвет не ствараецца і не разбураецца, вечна развіваецца па аб'ектыўных законах, якія людзі пазнаюць і выкарыстоўваюць у сваіх інтарэсах. Матэрыя — аб'ектыўная рэчаіснасць, якая абумоўлівае мысленне як уласцівасць пэўным чынам арганізаванай матэрыі. Дух не можа існаваць асобна ад матэрыі, і на свеце няма ніякіх непазнавальных таямнічых сіл. Д. м. арганічна звязаны з *атэізмам*. Маркс і Энгельс зрабілі пераварот не толькі ў поглядах на прыроду, але і ў разуменні грамадства і заканамернасцей яго развіцця. Характэрная рыса старога матэрыялізму — спалучэнне матэрыялізм. разумення прыроды з ідэаліст. разуменнем грамадскіх з'яў; рухальнай сілай гісторыі ён абвяшчаў погляды людзей і дзейнасць вялікіх асоб. Заснавальнікі марксізма дастасавалі матэрыялізм і дыялектыку да вывучэння чалавечага грамадства, стварылі *гістарычны матэрыялізм*, які бачыць аснову грамадскага развіцця ў спосабе вытворчасці матэрыяльных даброт, што вызначае характар грамадства, яго структуру, ідэі і паліт. погляды. Гэта дало магчымасць у сваю чаргу стварыць паслядоўны філас. светапогляд, растлумачыць законы чалавечага пазнання. У процілегласць старым філас. сістэмам, якія адлюстроўвалі інтарэсы невялікіх сац. груп, пераважна эксплуататарскай меншасці, і абмяжоўваліся вытлумачэннем свету, Д. м. выступіў як аснова светапогляду шырокіх пралет. мас, як тэарэт. зброя барацьбы рабочага класа ў рэвалюц. перабудове свету на навук. аснове. Найважнейшая якасць Д. м.— арганічная сувязь з практыкай, з рэвалюц. барацьбой. Марксізм пераадолеў адзін з гал. недахопаў старога матэрыялізму — недаацэнку актыўнай ролі тэарэт. думкі ў практ. дзейнасці і ўзброіў чалавецтва яснай перспектывай дзеяння, паказаў, куды ісці і за што змагацца. Толькі Д. м. Маркса, паводле слоў У. І. Леніна, паказаў пралетарыяту выхад з духоўнага рабства, у якім гібелі дагэтуль усе прыгнечаныя класы (гл. Тв., т. 19, с. 8). Д. м. адрозніваецца ад усіх папярэдніх філас. сістэм адкрытай валюнічай партыйнасцю, абаронай інтарэсаў рабочага класа, яго партый, усіх працоўных. Маркс і Энгельс адмовіліся ад спроб стварыць раз назаўсёды застылую філас. сістэму, якая мела на мэце падмяніць сабой усе астатнія навукі і рабіла іх непатрэбнымі. Д. м. займае зусім іншае месца ў сістэме навук. ведаў: ён апіраецца на законы і дасягненні ўсіх навук, узбройвае іх правільным метадам пазнання з'яў прыроды і чалавечай гісторыі для практ. перабудовы рэчаіснасці. Д. м. не атаясамліваецца з навукамі і не адрываецца ад іх, а грунтуе свае веды, апіраючыся на інш. навукі, і абагульняе іх дасягненні. Звязваючы ў адно цэлае вучэнне пра быццё і вучэнне пра яго адлюстраванне ў свядомасці, Д. м. спалучае ў сабе тэорыю пазнання і логіку (гл. *Дыялектычная логіка, Пазнанне*). Распрацаваная Д. м. дыялект. тэорыя развіцця (гл. *Дыялектыка*) паказвае агульныя законы, паводле якіх ажыццяўляюцца працэсы руху і змянення матэрыі, пераход ад больш нізкіх яе формаў да вышэйшых. Ленінскі этап развіцця Д. м. звязаны з абагульненнем рэвалюц. практыкі пралетарыяту ў эпоху імперыялізму і найноўшымі дасягненнямі ў галіне прыродазнаўства. Ленін даў класічнае вызначэнне матэрыі, ажыццявіў распрацоўку праблем тэорыі пазнання, паглыбіў разуменне асн. законаў і катэгорый матэрыяліст. дыялектыкі. Д. м. мае шматбаковае значэнне для практ. дзейнасці. Ён ляжыць у аснове праграмы, стратэгіі і тактыкі ўсіх марксісцка-ленінскіх партый; дае трывалую метадалагічную падставу для развіцця прыродазнаўчых і грамадскіх навук; садзейнічае фарміраванню камуніст. адносін, выхаванню новага чалавека, развіццю навук. светапогляду працоўных. Д. м.— грозная зброя супраць антыкамунізму. Апіраючыся на гістар. вопыт чалавецтва, на аб'ектыўныя законы гістар. развіцця, дае людзям цвёрдую ўпэўненасць у сілу чалавечых ведаў, у прагрэс. развіццё грамадства, у перамогу камунізм. ідэалаў ва ўсім свеце.

Літ.: Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952; яго ж. Тэзісы аб Феербаху, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 2, Мн., 1952; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; яго ж. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; яго ж. Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі, Мн., 1953; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Поли. собр. соч., т. 18); яго ж. Тры крыніцы і тры састаўныя часткі марксізма, Тв., т. 19 (там жа, т. 23); яго ж. Карл Маркс, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); яго ж. Аб значэнні ваюнічага матэрыялізму, Тв., т. 33 (там жа, т. 45); яго ж. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (там жа, т. 29); Диалектический материализм как методология естественнонаучного познания, Мн., 1965; Диалектический материализм, Мн., 1969.

П. Ф. Пратасеня. Мінск.

ДЫЯЛІЗ (грэч. diálysis аддзяленне), метад ачысткі калоідных растворaў і растворaў высокамалекулярных рэчываў ад растворaных у іх нізкамалек. рэчываў з дапамогай паўпранікальнай мембраны. Засн. на законах *дыфузіі*.

Калоідны раствор, які трэба ачысціць, наліваюць у сасуд з паўпранікальнай мембранай замест

дна. Сасуд апускаюць у другі, шырэйшы сасуд з дыстыляванай вадой, якую часта мяняюць. Мембрана прапускае ў ваду іоны і малекулы нізкамалекулярных рэчываў і не прапускае калоідных часцінак і макрамалекул. На мембрану выкарыстоўваюць пузыры жывёл, пергаментную паперу, калодый і цэлафан. Д.— вельмі павольны працэс, паскорыць яго можна павелічэннем паверхні мембраны, налажэннем эл. поля (электрадыяліз) і інш. Д. і электрадыяліз ужываюцца ў прамысловасці для ачысткі жэлацыны, дубільнікаў, у вытворчасці штучных валокнаў і інш.

ДЫЯЛО́Г (грэч. dialogos размова), 1) размова паміж дзвюма ці некалькімі асобамі. 2) Самастойны літ.-публіцыстычны жанр (філас. дыялогі Платона, «Пляменнік Рамо» Д. Дзідро, «Дыялог пра мастацтва» А. Луначарскага, анапімная «Гутарка пана з селянінам», «Сын і маці» Я. Купалы). 3) У драме адзін з маст. сродкаў стварэння вобраза і развіцця сюжэта. 4) Пказ тыпу паўлітургічнай драмы, у аснову якой паложаны пераказ евангельскага тэксту. Пашыраны на Беларусі ў 16—17 ст. У Д., якія паказвалі на плошчах і вуліцах, удзельнічалі духавенства, навучэнцы калегій і міране. Даваліся на польск. і бел. мовах. Зафіксаваны ў Полацку (1585, 1586, 1624), Магілёве (1698).

А. К. Саннікаў. Мінск.

ДЫЯМАГНЕТЫЗМ (ад грэч. diá прыстаўка, якая абазначае аддзяленне+*магнетызм*), сукупнасць магнітных уласцівасцей рэчываў, якія маюць адмоўную *магнітную ўспрымлівасць*. Дыямагнітныя целы (дыямагнетыкі) не прыцягваюцца, а слаба адштурхоўваюцца полюсам магніта. Д. уласцівы вісмуту, золату, ртуці, фосфару, цынку, медзі, натрыю і інш. хім. элементам, амаль усім арган. злучэнням. Гл. таксама *Парамагнетызм, Ферамагнетызм.*

ДЫЯМЕ́НТ (грэч. adámas несакрушальны), 1) тое, што *алмаз*, брыльянт. 2) Друкарскі шрыфт, памер якога (кегль) роўны 4 пунктам (каля 1,5 *мм*). Ужываецца пераважна для набору табліц. Гл. таксама *Шрыфт.*

ДЫЯНА (лац. Diana), у стараж.-рымскай міфалогіі багіня Месяца. Пазней пабыла рысы грэч. *Артэміды.*

ДЫЯНІН, лякарства, тое, што *этылмарфіну гідрахларыд.*

ДЫЯНІС (Diónysos), у старажытнагрэчаскай міфалогіі бог расліннасці, вінаградарства і вінаробства.

Земляробчы культ Д. перайшоў з крыта-мікенскай эпохі, быў асабліва папулярны ў Дэльфах і Атыцы. Святы ў гонар Д.— дыянісіі мелі характар оргій. Міф пра смерць і ўваскрэсенне Д. адлюстроўваў уяўленні стараж. грэкаў аб прыродзе. Многія элементы культу Д. запазычаны пазней хрысціянствам. У рымлян вядомы пад імем Вакха (Бахуса).

Літ.: Кун Н. А. Легенды и мифы Древней Греции, Свердловск, 1960.

ДЫЯНІСІЙ (каля 1440 — пасля 1503), рускі жывапісец. Большая частка работ Д. (фрэскі і абразы шэрагу рус. манастыроў, Успенскага сабора Маск. Крамля), выкананых з інш. жывапісцамі, не збераглася і вядома толькі па пісьмовых крыніцах. Сярод твораў, што зберагліся: абразы «Маці боская Адзігітрыя» (1482), «Распяцце» і «Спас у сілах» (абодва 1500), абразы і фрэскі Ферапонтавага манастыра (1502—03, з сынамі Уладзімірам і Феадосіем). У творчасці Д. выявілася сярэдневяковае разуменне ідэальнага свету. Стылю Д. ўласцівыя рытмічнае чаргаванне сэнсавых акцэнтаў у кампазіцыі, віртуознае валоданне лініяй, падоўжаныя прапорцыі чалавечых фігур, вытанчаная светлая і халодная колеравая гама.

Літ.: Лазарев В. Н. Дионисий и его школа, у кн.: История русского искусства, т. 3, М., 1955; Дионисий. Альбом, М., 1970.

ДЫЯНІСІЙ ФРАКІЙСКІ (каля 170—90 да н. э.), грэчаскі граматыст. Аўтар першай грэч. граматыкі, якая многія стагоддзі была ўзорам граматык розных моў.

ДЫЯПАЗО́Н у музыцы [ад грэч. diá pasón (chordón) цераз усе (струны)], гукавы аб'ём пэўчага голасу, муз. інструмента, мелодыі, ладу і да іх пад. Вызначаецца інтэрвалам паміж крайнімі па вышыні гукамі.


ДЫЯПІ́РЫЗМ, гл. *Саляная тэктоніка.*


ДЫЯПСІД (грэч. dis двойчы+opsis з'яўленне), мінерал з групы *піраксенаў*, сілікат кальцыю і магнію $CaMg[Si_2O_6]$, крайні член ізаморфнага раду дыяпсід — гедэнбергіт $CaFe[Si_2O_6]$. Крышталі манаклінной сістэмы, прызматычныя, кароткаслупкаватыя, агрэгаты зярністыя або радыяльнапрамяністыя. Жаўтавата- ці шаравата-шэрыя, радзей бясколерны. Бляск шкляны. Цв. 5,5—6; шчыльн. 3270—3380 *кг/м*³. Пародаўтваральны мінерал асноўных і ультрааснаў. вывергнутых парод, а таксама каптактава-метасаматычны ў скарнах.

ДЫЯРА́МА (ад грэч. diá скрозь+hórama відовішча), адзін з відаў выяўленчага мастацтва. Сасуд апускаюць у другі, шырэйшы сасуд з дыстыляванай вадой, якую часта мяняюць. Мембрана прапускае ў ваду іоны і малекулы нізкамалекулярных рэчываў і не прапускае калоідных часцінак і макрамалекул. На мембрану выкарыстоўваюць пузыры жывёл, пергаментную паперу, калодый і цэлафан. Д.— вельмі павольны працэс, паскорыць яго можна павелічэннем паверхні мембраны, налажэннем эл. поля (электрадыяліз) і інш. Д. і электрадыяліз ужываюцца ў прамысловасці для ачысткі жэлацыны, дубільнікаў, у вытворчасці штучных валокнаў і інш.

П. С. Крохалеў, У. А. Лагун, Л. М. Асядоўскі, Б. У. Аракчэеў. Цэнтр. частка дыярамы «Мінскі «кацёл». 1969—71. Бел. дзярж. музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мінск.







тва, у якім жывапісная карціна вял. памераў дапаўняецца аб'ёмным (бутафорскім) прадметным планам, макетам. Д. стварае ілюзію вялізных прасторaў і паказвае пераважна батальныя сцэны. У адрозненне ад *панарамы* ахоплівае не ўвесь круг гарызонта, а толькі яго частку. Сярод Д. бел. мастакоў: «Абарона Брэсцкай крэпасці» (1956—57, П. Дурчын, Ф. Зільберт), «Фашысцкі лагер смерці Малы Трасцянец» (1968, Я. Красоўскі, І. Пешкур), «Мінскі «кацёл» (1969—71, П. Крохалеў, У. Лагун, Л. Асядоўскі, Б. Аракчэеў) і інш.

ДЫЯРЫТ (ад грэч. dioráo адрозніваю), глыбінная, поўнакрышталічная магматычная горная парода, складзеная з сярэдняга плагіяклазу (андэзіну) і звычайна рагавой падманкі, часта з прымессю піраксену ці біятыту, зрэдку — кварцу (кварцавы Д.). Колер зеленавата-шэры. Утварае буйныя інтрузіі ў выглядзе баталітаў, штокаў. Ужываецца як буд. матэрыял, на брук і як аблiцовачны камень. Пашыраны ў крышталічным фундаменце Беларусі. На Пд рэспублікі (Мікашэвічы) мае прамысл. значэнне.

ДЫЯС (Diaz) Хасэ (3.5.1895, Севілья — 20.3.1942), дзеяч іспанскага і міжнар. рабочага руху. З рабочых. З юнацкіх гадоў удзельнічаў у рэвалюц. руху. Адзін з кіраўнікоў усеагульнай забастоўкі ў Севільі (1920). Няраз знявольваўся. З 1926 чл. Кампартыі Іспаніі (КПІ). Узначаліў Андалузскую абласную арганізацыю КПІ і накіраваў барацьбу перадавых сіл кампартыі супраць сектанцкіх элементаў у КПІ. З 1932 ген. сакратар КПІ. Пад яго кіраўніцтвам КПІ ператварылася ў масавую марксісцка-ленінскую партыю, якая адыграла выдатную ролю ў *іспанскай рэвалюцыі 1931—39*. На VII кангрэсе Камінтэрна (1935) выбраны чл. Выканкома Камінтэрна. Пасля паражэння рэспублікі Д. не пераставаў кіраваць барацьбой кампартыі супраць фашызму і супраць удзелу Іспаніі ў 2-й сусв. вайне на баку дзяржаў фаш. блоку.



Літ.: Ибаррури Д. Беззаветный борец за дело испанского народа. [Некралог], «Коммунистический Интернационал», 1942, № 3—4; [Благоева С.]. Хозе Диас. [М.], 1938.

ДЫЯСПОР (грэч. diasporá рассеяние), мінерал, гідравокіс алюмінію $HAlO_2$. Крышталі тонкапласціністыя, таблітчастыя, слупкаватыя, агрэгаты ліставатыя або тонкалускаватыя. Колер жаўтавата-буры, светла-фіялетавы, зеленавата-шэры. Бляск шкляны. Цв. 6,5—7. Вельмі крохкі. Шчыльн. 3300—3500 *кг/м*³. Паходжанне пераважна кантактава-метасаматычнае і экзагеннае. Пашыраны ў радовішчах *бакситаў*. Руда на алюміній.

ДЫЯСТАЗА, тое, што *амілаза*.

ДЫЯТАМІТ (грэч. diatomē раз'яднанне), дыятомавая зямля, порыстая асадкавая горная парода, утвораная з дыятомавага ілу з прымессю гліністага матэрыялу, кварцу і глаўканіту. Змяшчае да 98% крамянязёму. Колер светла-шэры, жаўтаваты або белы, зрэдку цёмна-шэры. Парода рыхлая або слаба цэментаваная. Паходжанне марское ці азёрнае. Пашыраны ў палеагенавых і неагенавых адкладах Паволжа, Урала, Закаўказзя, Крыма, у антрапагене Ленінградскай вобл. Выкарыстоўваецца як адсарбент, тэрма- і гукаізалятар, абразіў, як гідраўлічная дабаўка ў вытворчасці вяжучых матэрыялаў.

ДЫЯТОНІКА (ад грэч. diatonikós літаральна — расцягнуты), сістэма ладоў, ступені якіх знаходзяцца ў інтэрвальных суадносінах, уласцівых гукам асн. гукараду.

Уключае лады, абмежаваныя поўным актаўным гукарадам (натуральны мажор, натуральны мінор, дарыйскі, фрыгійскі, лідыйскі і інш.) або яго часткай (гексахорды, пентатоніка, шэраг тэтрахордаў і трыхордаў). Паняцце Д. пашыраецца і на ўзаемасувязі акордаў, пабудаваных на ступенях дыятанічных ладоў, на танальныя суадносіны. У больш шырокім сэнсе да Д. ўмоўна адносяць усе лады, паазбаўленыя *альтэрацыі*, г. зн. павышэнняў ці паніжэнняў асн. ступеняў. Гэта ўмоўна-дыятанічныя лады (гарманічны і меладычны мінор і мажор і інш.), пераменна-дыятанічныя. Д.— аснова муз. мовы ў нар. і прафесійнай музыцы.

ДЫЯТЭЗ (грэч. diáthesis схільнасць), стан арганізма, пры якім фізіялагічныя раздражняльнікі могуць быць прычынай паталагічных змен. Д. звязваюць з канстытуцыяй чалавека — сукупнасцю прыроджаных і набытых уласцівасцей, на якія ўплывае вонкавае асяроддзе. Бывае пераважна ў дзяцей. Д. спрыяюць змены харчавання, т-ры, вільготнасці і некат. хваробы.

Адрозніваюць 3 формы Д.: эксудатыўна-катаральны з парушэннем водна-мінер. абмену, высыпкай на скуры і слізістых абалонках, запаленнямі дыхальных шляхоў і хваробамі страваваль на-кішачнага тракту; лімфатыка-гіпапластычны з паніжанай устойлівасцю і схільнасцю да хвароб эндакрынных залоз і нервовай сістэмы; нервова-артрытычны з парушэннем абмену рэчываў, асабліва пурынавага абмену, з хваробамі суставаў, атлусценнем. Лечаць хворых ад хвароб, якія ўзніклі на аснове Д., па агульных правілах з улікам асаблівай схільнасці арганізма да Д. Прафілактыка: рацыянальнае харчаванне, вітаміны, солі кальцыю, заспакаяльныя і гарманальныя сродкі.

Літ.: Многотомное руководство по педиатрии, т. 1, М., 1960 (бібліягр.); Усов И. Н. и Мазо Р. Э. Пособие по педиатрии для врачей, Мн., 1969.

А. К. Усцінovіч. Мінск.

ДЫЯТЭЗ ГЕМАРАГІЧНЫ, прыроджаныя або набытыя хваробы крыві, асноўная прыкмета якіх — павышаны крывацёк. Набытыя бываюць першасныя і другасныя (ад інфекцый, інтаксікацый, авітамінозаў, алергій, хвароб печані, нырак, крыві).

Асн. сімптомы: крывазліццё ў суставы, пад скуру, крывацёк са слізістых абалонак. Удакладняюць дыягназ гематалагічнымі даследаваннямі. Лячэнне: аднаўленне парушанага працэсу згусання крыві (антыгемарагічны глабулін, пераліванне крыві і плазмы — гемафілія); пераліванне тромбацытарнай масы, кортыкастэроіды (АКТГ, картызон, прэднізалон, трыямсіналон), вітаміны (С, Р, групы В), аперацыя (пры хваробе Верльгофа); хлорысты кальцый, саліцылаты, кортыкастэроіды (гемарагічны паскуліт). Прафілактыка: лячэнне ачагоў інфекцый, засцярога ад траўмаў, багатая на вітаміны ежа.

Літ.: Кассирский И. А. и Алексеев Г. А. Клиническая гематология, 3 изд., М., 1962; Тур А. Ф. Гематология детского возраста, 2 изд.,

Л., 1963; Довгялло Г. Х. и Крыжанов-ский В. Л. Практическое руководство по исследованию свертывающей системы крови в клинике. Мн., 1969.

Л. І. Дабелка. Мінск.

ДЫІФАНІЯ (ад грэч. diaphánéia праразрыстасць), паліграфічны спосаб нанясення малюнку на праразрыстыя матэрыялы (шкло, пластмасы і інш.), насыпаны на *бакальманіі*.

Выява пры Д. друкуецца праразрыстымі і вельмі інтэнсіўнымі фарбамі, замацоўваецца лакавымі напрыцемкі. Д. ужываецца для надобы вонкавых рэкламных надпісаў і малюнкаў на шыбах вітрын, вырабу шкал радыёпрыёмнікаў і г. д.

ДЫІФАНТ Александрыйскі (Diophantos; жыў у 3 ст.), старажытнагрэчаскі матэматык. Аўтар трактата «Арыфметыка» (збераглося 6 кніг з 13) і працы пра т. зв. многакутныя лікі (асталіся ўрыўкі). У «Арыфметыцы» дасць рашэнне задач, якія прыводзяць да т. зв. *дыяфантавых ураўненняў*.

ДЫІФАНТАВЫ ЎРАЎНЕННІ (ад імя *Дыяфанта*), алгебраічныя ўраўненні ці сістэмы ўраўненняў з цэлымі каэфіцыентамі, што маюць цэлыя ці рацыянальныя рашэнні.

У Д. у. ужываюць невядомых перавышае колькасць ураўненняў, і таму іх часам наз. неазначальнымі. Найпрасцейшае Д. у. $ax+by=1$, дзе a і b — цэлыя ўзаемна простыя лікі. Такое ўраўненне мае бесканечную колькасць рашэнняў. Калі x_0 і y_0 — адно рашэнне, то $x=x_0+bn$ і $y=y_0-an$ (n — любы цэлы лік) даюць усю сукупнасць рашэнняў. Д. у. больш высокіх ступеняў (напр., $a_0x^n+a_1x^{n-1}y+\ldots+a_ny^n=0$, дзе $n\geq 5$) вывучаюцца асобна. Відомай задачай тэорыі Д. у. з'яўляецца вывядзенне тэарэмы Ферма (гл. *Ферма тэарэмы*).

ДЫІФІЛЬМ (ад грэч. diá праз + *фільм*), рад чорна-белых ці каляровых дыяпазітываў на кінаплёнцы, аб'яднаных агульным сюжэтам і дз. тэкстам.

Складаецца з 50—70 кадраў, якія гледзяць паасобку. Есць вучэбныя Д. У СССР Д. выпускае маст. студыя «Дыяфільм». Выкарыстоўваюцца ў навуч. працэсе, у лекцыйнай і прапагандысцкай рабоце. Для прагляду і дэманстрацыі Д. карыстаюцца фільмаскопамі і дыяпраектарамі. На Беларусі дыяпраектары вырабляе Мінскі механічны з-д імя Вавілава.

Літ.: Мининков И. В. Диапозитивы и диафильмы, М., 1966; Кузнецов С. и Тонорон И. Советский диафильм, М., 1962.

ДЫІФРАГМА (у тэхніцы), 1) кальцавая перагародка ў трубаправодзе для стварэння перападу ціску (да і пасля Д.), каб вызначыць расход вадкасці. 2) Вертыкальная сценка ў цэлю вемлянных і каменепакідных плацін для забеспячэння іх водапранікальнасці. 3) Д. фатаграфічная, прыстасаванне для змены велічыні дзейнай адтуліны аб'ектыва (дыяфрагмавання).

Сучасныя фота- і кінааб'ектывы амаль заўсёды маюць ірысавую Д., размешчаную між лінзамі аб'ектыва.



а *б* *в*

Схема дзеяння ірысавай дыяфрагмы: максімальнае (*а*), сярэдняе (*б*) і мінімальнае (*в*) адчыненне дзейнай адтуліны аб'ектыва.

Яна складаецца з некалькіх пялёсткаў серпападобнай формы, замацаваных на кольцы, павароты якога выклікаюць дыяфрагмаванне. Радзей бываюць раваліярныя (дзеці з адтулінамі розных дыяметраў) і устаўныя (набор пласцінак з рознымі адтулінамі розных велічынь). Дыяфрагмаванне амаль заўсёды робіцца і светавым патокам. У СССР прыняты стандартны рад лічбавых значэнняў адносных адтулін для рабудовы шкал Д. фатаграфічных: 1/0,7; 1/1; 1/1,4; 1/2; 1/2,8; 1/4; 1/5,6; 1/8; 1/11; 1/16; 1/22; 1/32; 1/45; 1/64.

ДЫІФРАГМА (грэч. diáphragma перагародка), **грудабрушная перапона**, мышэчна-сухажыльная перагародка ў млекакормячых жывёл і чалавека, якая аддзяляе грудную поласць ад брушной. Удзельнічае ў дыхальных рухах.

ДЫІФТАРОЗ (ад грэч. diaphtora разбурэнне), наўторны, рэгрэсіўны *метамарфізм горных парод*. Адбываецца пры адносна нізкіх т-рах, з нагрыманнем вады і вугляслаты. Гнейсы, утвораныя на ўмовах глыбіннага высокатэмпературнага метамарфізму, пры працэсах Д. ператвараюцца ў слянцаватыя пароды — дыяфтарыты, падобныя на *філіты* (напр., слянцы Станавога хр. ў Усх. Сібіры).

ДЭ... (лац. de...), прыстаўка, якая абазначае: 1) аддаленне, выдаленне, адмену і г. д., напр. *дэзінтэграцыя*, *дэмабілізацыя*; 2) рух уніз, вонкі, напр. дэградацыя.

ДЭАНТАЛОГІЯ медыцынская (грэч. deon абавязак + ...*logia*), прынцыпы паводзін мед. персаналу ў адносінах да хворых. Частка ўрачэбнай этыкі (гл. *Этыка*). Асн. задача Д. — ахова псіхікі хворага — арыентуецца праз учынкі слова ўрача і асяроддзя. Слова ўрача аблягчае боль, пераканаўча ў неабходнасці лекавых мерапрыемстваў. Ліквідацыя шкоднага ўплыву вонкавага асяроддзя праз уважлівую арганізацыю лячэбна-ахоўнага рэжыму ў мед. установах (барацьба з болем, ціхія, чыстыя, утульныя, светлыя палаты, чулы адносіны да хворага і інш.). Д. сав. ўрача грунтуецца на прынцыпах агульнай камуністычнай маралі (гл. *Мараль*).

Тэрмін Д. уведзены англ. пісьменнікам І. Бентамам (18 ст.). З старажытнасці вядомы вялікі ўплыў слова ўрача на псіхічны і фіз. стан хворага і роля слова ў развіцці ўчэных (атрыманні хвароб, Рус. ўрачы М. І. Мудроў, С. П. Боткін, У. М. Бехцераў і інш. надрасліваці лекавае ўздзеянне слова. Механізм уплыву слоў на хворага раскрыты І. П. Паўлавым.

Літ.: Поздняков С. А. Содержание и соотношение понятий «врачебная этика», «деонтология» и «врачебная мораль», у кн.: Материалы VI научной сессии Гродненского гос. мед. ин-та, Гродно, 1966; Всесоюзного симпозиума по этике, М., 1970; Чеботарева Л. И. Врачебная этика, М., 1967; Писарев Д. И. Основные проблемы врачебной этики и медицинской деонтологии, М., 1967; Вайль С. С. Некоторые вопросы врачебной деонтологии, 3 изд., Л., 1969.

М. А. Чалееў, Мінск.

ДЭЛЯТАР (ад *дэ...* (1) + грэч. *аўтар* паветра), апарат для выдалення газаў (паветра) з вады, прызначаны для сілкавання цепласілавых установак. Ужываецца, каб не дапусціць карозіі катлоў і інш. цеплатэхн. абсталявання. Д. падзяляюцца ў залежнасці ад ціску — на атмасферныя і вакуумныя; паводле спосабу падагрэву вады — на вмешвальныя і Д. перагрэтай вады.

Прынцып дзеяння заснаваны на выдаленні газаў з вады пры яе кіпячэнні. У атмасферных Д. вада награваецца да 105 °С пад ціскам $1,15\cdot10^5$—$1,2\cdot10^5$ Н/м² (1,15—1,2 ат) і ў назапашвальнік паступае ўжо кіпячонай. Газ, што вылучаецца пры ціску $0,8\cdot10^5$—$0,9\cdot10^5$ Н/м² (=0,8—0,9 ат) і пры адпаведна меншай т-ры, у струменевых Д. выдаляецца ў верхнюю частку Д., дзе расшчапляецца і сцякае ўніз (гл. рыс.). Насупраць пускаецца пара, якая награе ваду




Схема струменнага дэаратара.

да кіпення. Пры гэтым газы і лішні пары (выпар) выдаляюцца ў атмасферу.

Літ.: Другов Л. Н. и др. Вспомогательное оборудование тепловых электростанций, М., 1968; Труб И. А. и Литвин О. П. Вакуумные деаэраторы, М., 1967; Широб М. С. Удаление коррозионно-агрессивных газов из питательной воды, М., 1959.

ДЭБАРКАДЭР (франц. débarcadère), 1) плывучая прыстань для рачных суднаў, бываюць пасажырскія, груза-пасажырскія і грузавыя. Забяспечаны сродкамі механізацыі грузавых работ. 2) Устарэлая назва чыгуначнай станцыйнай платформы.

ДЭБАЯ ЗАКОН, залежнасць, паводле якога цеплаёмістасць C_v крышталічнай рашоткі адпаватамных цвёрдых цэлаў пры нізкіх тэмпературах прапарцыянальная кубу абсалютнай тэмпературы T. Выведзены ў 1912 галандскім фізікам-тэарэтыкам П. Дэбаем.

Д. з. мае выгляд $C_v=77{,}94\cdot3R(T/\theta)^3$, дзе R — універсальная газавая пастаянная, $\theta=\tau$. зв. дэбаеўская характарыстычная т-ра рэшаткі. Д. з. прыблізны, аднак пры дастаткова нізкіх т-рах добра адпавядае эксперыменту. Велічыня θ можа быць вызначана праз другія пастаянныя крышталя. Яна адыгрывае важную ролю ў тэорыі цвёрдага цела, у прыватнасці вызначае тэмпературную грань, вышэй якой становяцца істотнымі квантавыя эфекты.

Літ.: Федоров Ф. И. Теория упругих волн в кристаллах, М., 1965, с. 352—366.

ДЭВЕСІ, вёска ў Кальчуненскім с/с Аніміцкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 6 км на ПдЗ ад Аніміі, 214 км ад Гродна, 24 км ад чыг. ст. Аніміны. 116 ж., 56 гас. 30 (1971). Нач. школа, магазін.

ДЭБЕТ (ад лац. debet ён павінен), назва левай паловіны бухгалтарскага рахунку.

Вынес запісаў у Д. вызначаюць ад прызначэння рахунку: Д. рахункаў актыву адлюстроўвае наяўнасць матэрыяльных, тавара-матэрыяльных і грашовых сродкаў, Д. рахунку пасіву — намінальнага капіталу, а Д. падліковых рахункаў — страты у вынік гасп.-фін. дзейнасці прадпрыемства. Процілеглае значэнне мае *крэдыт*.

ДЭБІЦ Георгій Францавіч [24.11(7.12).1905, Томск — 10.1.1969], савецкі антраполаг. Д-р біял. н. (1941), праф. (1944). Скончыў Іркуцкі ДУ, з 1945 у ін-це антрапологіі пры МДУ, з 1945 у ін-це этнаграфіі АН СССР. Даследаваў пытанні выкарыстання антраналагічнага матэрыялу як гістар. крыніцы на прадмеце этагенезу. Распрацоўваў методыку антраналагічных даследаванняў, вывучаў рассавы антраналагічны склад народаў СССР і Афганістана. Упершыню даследаваў краніялагічны матэрыял на нас. Беларусі 10—13 ст.

Тв.: Черепа Дюшэнага Могільніка і старажытных славян Беларусі, у кн.: Працы секцыі археалогіі (ЗАН), т. 3, Мн., 1932; Палеоантрапалогія СССР, М.—Л., 1948 (Труды Ин-та этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая, Нов. сер., т. 4).

І. І. Салавей, Мінск.

ДЭБІТ (ад франц. débit расход), колькасць вадкасці або газу, якую дае крыніца, свідравіна ці калодзеж на адзінку часу. Выражаецца ў *л/сек*, *м³/гадз*, *м³/сутк*, пры нафтаздабычы — у *т/сутк*. Д. вымяраюць дэбітомерамі, мернымі посудамі і вадазлівамі або вылічваюць паводле формул *дынамікі падземных водаў*.

ДЭБІТОР (ад лац. debitor даўжнік), даўжнік прадпрыемства, арганізацыі ці установы (пакупнік, які не аплаціў за адгружаны яму тавар, кватаранаймальнік, які пратэрмінаваў плату за кватэру). Параўн. *крэдытор*.

ДЭБОРЫН (Іоффе) Абрам Майсеевіч [4(16).6.1881, Коўна — 8.5.1963], савецкі філосаф і гісторык. Акад. АН СССР (1929). Чл. КПСС з 1928. Скончыў філас. ф-т Пермскага ун-та (1909). З 1903 бальшавік, у 1907—17 меншавік. З 1920 займаўся пед. і навук. дзейнасцю. У 1926—30 адзіны радактар час. «Под знаменем марксизма». З 1935 у АН СССР. Даследаваў пытанні меншавіцка-ідэалістычнага характару, асуджаныя ў пастанове ЦК ВКП(б) пра час. «Под знаменем марксизма» (1931). У апошніх працах крытыкаваў буржуазную ідэалогію і даследаваў гісторыю сацыяльна-палітычнай думкі.

Тв.: Людвиг Фейербах. Личность и мировоззрение, М., 1923; Диалектика и естествознание, М.—Л., 1930; Ленин и призыв новейшей физики, Л., 1930; Очерки по истории материализма XVII—XVIII вв., 3 изд., М.—Л., 1930; Введение в философию диалектического материализма, 6 изд., М.—Л., 1931; Карл Маркс и современность, М.—Л., 1933; Философия и политика, М., 1961; Социально-политические учения нового и новейшего времени, в 3-х т., т. 1—2, М., 1958—67.

ДЭБЮСІ (Debussy) Клод Ашыль (22.8.1862, Сен-Жермен-ан-Ле — 25.3.1918), французскі кампазітар, піяніст, дырыжор, музычны крытык. Пачынальнік муз. *імпрэсіянізму*. Скончыў Парыжскую кансерваторыю ў 1884. Паведаў Расію (нач. 80-х г., 1913). У творчасці ўпаўнаў уплыў рус. музыкі, асабліва М. Мусаргскага. Пляснасць да мастакоў-імпрэсіяністаў і да гуртка паэта-сімвалісга С. Маларме (канец 80-х г.) паскорыла выспяванне эстэт. прынцыпаў Д. Маніфестам муз. імпрэсіянізму стала яго арк. праслюдыя «Пасляпаўдзённы адпачынак фаўна» (1894). Асн. ўвагу кампазітар аддае адлюстраванню прыроды, фіксацыі выкліканых ёю ўражанняў; сустракаюцца ў яго творчасці каларыстычна-жывапісныя жанравыя замалёўкі, вобразы фантастыкі, нар. легендаў, антычнасці, франц. мастацтва 18 ст. Музыцы Д. ўласцівыя пастаянасць настроюў, свежыя гучанні аварату старажытнага.



тапічных ладоў (таксама цэлатонных і пентатонных), тэмбрава-каларыстыч. гармоній, маляўнічая фактура аркестравага, ансамблевага і фп. пісьма. У сімфанізаванай муз. драме «Пелеас і Мелізанда» паводле М. Метэрлінка (1902) стварыў новы тып псіхал.-праўдзівай муз. дэкламацыі. Наватарскія дасягненні Д. ўспрыняла сусв. музыка 20 ст.

З твораў: для сімф. аркестра — Накцюрны (1897—99), Мора (1903—05), Вобразы (1906—12); струнны квартэт (1893), саната для скрыпкі і фп. (1917); для фп.— Эстампы (1903), Вострыя радасці (1904), Вобразы (1905—07), Дзіцячы куток (1906—08), 24 прэлюдыі (1910—13), 12 этюдаў (1915); болей за 50 песень і рамансаў.

Літ. тв.: Рус. пер.— Статьи, рецензии, беседы, М.— Л., 1964.

Літ.: Кремлев Ю. Клод Дебюсси, М., 1965; Роллан Р. Музыканты наших дней, пер. с франц., П., 1923; Vallas L. Claude Debussy et son temps, Paris, 1958.

ДЭВАЛЬВАЦЫЯ (*дэ*...+лац. valeo каштую), рэформа грашовага абарачэння ў капіталіст. краінах, якая заканадаўча замяншае залатую (сярэбраную) вартасць грашовай адзінкі і паніжае курс папяровых грошай у адносінах да золата ці замежнай валюты. Вынік абясцэньвання валюты і падзення яе пакупной здольнасці. Выкарыстоўваецца з мэтай часовай стабілізацыі грашовага абарачэння ва ўмовах *інфляцыі*.

Д. бывае адкрытая і скрытая. Да агульнага крызісу капіталізму звычайна суправаджаўся абменам абясцэненых грашовых знакаў на паўнацэнныя грошы: пры адкрытай Д.— на металічныя ці на крэдытныя грошы па курсе, ніжэйшым за намінальную вартасць папяровых грошай; пры скрытай — на грошы, паўнацэнныя па намінале, але з адначасовым паніжэннем залатой (сярэбранай) вартасці грашовай адзінкі краіны. Адкрытая Д. праведзена ў Расіі ў 1839—43, калі 3 руб. 50 кап. папяровых грошай (асігнацый) прыраўноўваліся да 1 руб. серабром. Д. 1897 у Расіі была скрытая: залатая вартасць рубля паніжана на ⅓. У час агульнага крызісу капіталізму Д. стала частай з'явай у капіталіст. краінах і не суправаджаецца абменам абясцэненых грашовых знакаў на паўнавартасныя грошы. У Францыі за 1928—58 Д. франка праводзілася 15 разоў. Масавая была Д. ў 1949, якая ажыццяўлялася не зніжэннем залатой вартасці валют, а паніжэннем курсу большасці валют капіталіст. краін у адносінах да долара ЗША. Таму курс долара быў штучна павышаны, што дало магчымасць амер. манаполіям выгадна купляць прадпрыемствы ў зах.-еўрап. краінах, вывозіць адтуль сыравіну і ваен.-стратэгічныя матэрыялы. Новая хваля Д. пачалася ў 2-й пал. 60-х г. 20 ст. ў сувязі з непамернымі выдаткамі капіталіст. краін на ваен. мэты. За 1956—66 праведзена Д. папяровых грошай 44 капіталіст. дзяржаў. У 1967 дэвальвіравалі фунт стэрлінгаў Вялікабрытаніі (падзешавеў на 14,3%), а таксама валюты краін *стэрлінгавай зоны*. У 1969 Францыя на 12,5% ажыццявіла Д. франка. У выніку Д. павышаецца канкурэнтная здольнасць манаполій і пагаршаецца становішча працоўных, бо Д. вядзе да росту ўнутраных цэн і памяншэння рэальнай заработнай платы.

Літ.: Аникин А. В. Валютные проблемы Западной Европы, М., 1960; Селихов Е. И. Валютный кризис капитализма, М., 1969.

М. В. Верабей. Мінск.

ДЭВАСТАЦЫЯ (лац. devastatio спусташэнне, знішчэнне), комплекс мерапрыемстваў для знішчэння ўзбуджальнікаў інфекцыйных і інвазійных хвароб чалавека, жывёл і раслін. Тэрмін прапанаваў сав. вучоны К. І. Скрабін (1944). Раздзелы Д.: *дэгельмінтызацыя*, хіміятэрапія, бактэрыяфагія (гл. *Бактэрыяфаг*), *дэзінвазія*, *дэзінсекцыя*, *дэзінфекцыя*.

Літ.: Краткий курс паразитологии домашних животных, 6 изд., М., 1950; Эпидемиология, 2 изд., М., 1968.

ДЭВІЗЫ (франц. адз. л. devise), плацежныя сродкі, выражаныя ў замежнай валюце (*чэкі*, *вэксалі*, *каштоўныя паперы*, *акрэдытывы* і інш.), якія служаць для міжнар. разлікаў. У эканам. л-ры тэрмін Д. абазначае і замежную валюту. Найб. пашыраны ў міжнар. разліках від Д.— тэлеграфныя пераводы, калі разлік робіцца ў кароткі тэрмін. Цана Д. ў нац. валюце вызначаецца *валютным курсам*.

ДЭВОНСКІ ПЕРЫЯД (СІСТЭМА), дэвон (ад назвы графства Дэваншыр у паўд.-зах. Англіі), чацвёрты перыяд *палеазойскай эры* ў гісторыі Зямлі, наступны за сілурыйскім, папярэднічае каменнавугальнаму. Пачаўся 405 млн. гадоў назад, цягнуўся 55 млн. гадоў. Вылучаны ў самастойную сістэму англ. даследчыкамі Р. І. Мурчысанам і А. Седжвікам у 1839. Падзяляецца на аддзелы (ніжні, сярэдні, верхні) і кожны з іх адпаведна на 2 ярусы (жэдзінскі і кобленцкі, эйфельскі і живецкі, франскі і фаменскі). У СССР (Усх.-Еўрап. платформа, Урал, Кузбас) Д. п. падзяляецца больш дробна.

Арганічны свет Д. п. больш высокаразвіты, чым у сілуры. З жывёл у морах выміраюць грапталіты, часткова трылабіты; развіваюцца ганіятыты, брахіяподы, каралы; характэрны астракоды, крынаідэі, канадонты. Д. п.— «век рыб» панцырных, кісцепёрых, дваякадыхальных, якія панавалі пераважна ў лагунах, азёрах, рэках. У канцы перыяду на сушы з'явіліся першыя наскомыя і земнаводныя (стэгацэфалы). Раслінны свет — водарасці, у верхнім дэвоне — дзеразовыя, членістасцябловыя і папарацепадобныя; у канцы перыяду выміраюць псілафіты і з'яўляюцца прымітыўныя голасенныя. З дрэвападобных раслін утварыліся першыя невялікія пласты кам. вугалю (Кузбас, в-аў Мязведжы). Абнаўленне жывёльнага і раслінага свету ў Д. п.— вынік вялікіх змен фіз.-геагр. умоў, якія адбыліся на Зямлі ў канцы сілуру пасля завяршэння *каледонскай складкавасці*. Большая частка сучасных мацерыкоў у ніжнім і часткова ў сярэднім Д. п. была занята сушай. У гэты час у Прыбалтыцы, Прыўраллі, Шатландыі і інш. раёнах пры разбурэнні гор і ўзвышшаў утварыліся магутныя тоўшчы чырванаколерных пясчанікаў. На Беларусі ніжнедэвонскія адклады не выяўлены. У сярэднім і верхнім дэвоне вял. плошчы Еўропы, Азіі, Паўн. Амерыкі і часткова Аўстраліі, Афрыкі і Паўд. Амерыкі былі ўкрыты морамі, у якіх вымажаліся пераважна карбанатныя адклады.

Адклады сярэдняга і верхняга дэвону пашыраны на большай ч. тэр. Беларусі (каля 60%). Іх магутнасць у цэнтры і на ПнУ рэспублікі ад 40 да 400 *м*. Складзены з пясчана-гліністых і карбанатных парод жывецкага і часткова франскага ярусаў. Найбольш поўны разрэз дэвону (да 3—4 тыс. *м*) ускрыты свідравінамі на ПдУ рэспублікі (гл. *Прыпяцкая ўпадзіна*), дзе ўтварэнні жывецкага, франскага і фаменскага ярусаў складзены з тэрыгенных, карбанатных, вулканагенных і галагенных парод. З адкладамі дэвону на Беларусі звязаны радовішчы нафты (Рэчыца, Асташкавічы, Давыдаўка, Віша), калійных (Старобін, Петрыкаў) і каменных (Мазыр) соляў, гаручых сланцаў (Тураў, Любань), даламітаў (Бецебск), мінер. водаў.

Літ.: Геологическое строение СССР, т. 1, М., 1968; Голубцов В. К. и Махнач А. С. Фации территории Белоруссии в палеозое и раннем мезозое, Мн., 1961; Литология и геохимия девонских отложений Припятского прогиба в связи с их нефтеносностью, Мн., 1966. *С. А. Кручак.* Мінск.

ДЭГА (Degas) Эдгар (19.6.1834, Парыж — 26.9.1917), французскі жывапісец і скульптар. Раннія работы — партрэты і гістар. кампазіцыі. Сталыя творы Д. пра тагачаснае жыццё Парыжа (скачкі, балет, т-р). Далучаўся да імпрэсіяністаў, але ў адрозненне ад іх прытрымліваўся дакладнага малюнка. Лепшыя работы Д. («Абсент», 1876; «Прасавальшчыцы», каля 1884), вызначаюцца высокай тэхнікай, праўдзівасцю і вастрынёй характарыстык, якія часта маюць сац. адценне. З цягам часу ў творчасці Д. ўзмацніліся дэкар. тэндэнцыі («За туалетам», каля 1889; «Блакітныя танцоўшчыцы», каля 1879). У канцы жыцця займаўся скульптурай.




Літ.: Дега. [Альбом рэпрадукцый. Скл. і аўтар уступ. арт. Б. Зярноў], Л.— М., 1965.

ДЭГАЗАЦЫЯ (ад *дэ*...+*газ*), абяшкоджванне або выдаленне стойкіх атрутных рэчываў з заражаных аб'ектаў.

Ажыццяўляецца нейтралізацыяй дэгазавальнымі рэчывамі (хлорная вапна, солі гіпахларыту кальцыю, вуглякіслы натрый, амічная вада і інш.), змываннем арган. рэчывамі, кіпячэннем заражаных рэчываў у вадзе, выкарыстаннем спец. машын і прылад, а таксама машын камунальнай гаспадаркі (паліваўных, снегаачышчальных), дарожна-будаўнічых (грэйдэраў, бульдозераў), с.-г. (раскідальнікаў, плугоў, апырсквальнікаў).

Літ.: Гл. пры арт. *Засцярога ад зброі масавага паражэння.* *Я. А. Ярошык.* Мінск.

ДЭГЕЙТЭР, Дэжэйтэр (Degeyter) П'ер (8.10.1848, г. Гент — 27.9.1932), французскі кампазітар, па прафесіі рабочы-мэбельшчык. Чл. Рабочай партыі, з 1920 камуніст. Кіраваў рабочымі хорамі ў Лілі і Сен-Дэні. У 1888 напісаў музыку «Інтэрнацыянала», які стаў міжнар. пралетарскім гімнам. З песень Д.: «Наперад, рабочы клас», «Камунар», «Трыумф рускай рэвалюцыі», «Серп і молат». У 1928 наведаў СССР.



Літ.: Сохор А. «Интернационал» и его авторы, М., 1960.

ДЭГЕЛЬМІНТЫЗАЦЫЯ (*дэ*...+грэч. helmins гліст, чарвяк), комплекс лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў па знішчэнні гельмінтаў (паразітычных чарвей) на ўсіх стадыях іх развіцця ў арганізме чалавека або жывёлы і ў навакольным асяроддзі (глеба, гной).

Д. ўваходзіць у агульны даляр. проціэпідэмічны і проціэпізаатычны план. Праводзіцца з лячэбна-прафілактычнай і дыягнастычнай мэтамі з выкарыстаннем проціглісных (антыгельмінтных) сродкаў (піперазін, філіксан, насенне гарбузоў, гексахлорэтан і інш.), высокай т-ры і хірург. апэрацый.

Літ.: Чеботарев Р. С. и Ратнер Ю. Б. Краткий паразитологический словарь, Мн., 1962; гл. таксама літ. пры арт. *Гельмінтазоі, Дэвастацыя.*

ДЭГЕНЕРАЦЫЯ (лац. degenero выраджаюся), 1) разбурэнне тканак і органаў у працэсе індывідуальнага развіцця асобіны (антагенезу), напр., зніжэнне хваста пры ператварэнні апалоніка ў жабу. 2) Выраджэнне сартоў культ. раслін і парод свойскіх жывёл, пры якім з пакалення ў пакаленне горшаюць каштоўныя прыстасавальныя і гасп. ўласцівасці. 3) Агульнае або частковае спрашчэнне арганізма жывёл ці раслін, якое ўзнікае ў філагенезе шляхам рэдукцыі пекат. органаў. Паняцце агульнай і частковай Д. ўведзена акад. А. М. Северцавым.

Літ.: Северцов А. Н. Морфологические закономерности эволюции, Собр. соч., т. 5, М.— Л., 1949.

ДЭГУСТАЦЫЯ (лац. degustatio каштаванне), ацэнка якасці харчовых прадуктаў арганалептычным спосабам (органамі зроку, нюху, смаку).

Пры Д. віна вызначаюцца смак, букет, празрыстасць і колер, для пеністых яшчэ і пеністасць. Пры Д. чаю ацэньваецца пах, смак і колер настою, выгляд сухога чаю і разварэнага ліста. У тытуні вызначаюць пах, смак, моцнасць, налўнасць у дыме алеістых рэчываў. Дэгустуюць таксама стравы, кансервы і інш. прадукты.

ДЭДАЛ І ІКАР (Dáidalos, Ikaros), персанажы старажытнагрэчаскай міфалогіі. Дэдал — выдатны механік, будаўнік, скульптар, Ікар — яго сын. Дэдал лічыцца заснавальнікам сталярнай справы, вынаходнікам многіх прылад. Паводле легенды пабудаваў Лабірынт на в-ве Крыт, але трапіў у нямілась да цара Мінаса і быў зняволены. Зрабіў з пер'я і воску крылы, на якіх ратаваўся з Ікарам. Дэдал далятеў да Сіцыліі, а Ікар вельмі наблізіўся да сонца, воск на крылах растаў, ён упаў у мора і загінуў. Вобраз Ікара, чалавека, які ўзляцеў да сонца, выкарыстоўваўся ў маст. л-ры.

Літ.: Куп Н. А. Легенды и мифы Древней Греции, Свердловск, 1960.

ДЭДУКЦЫЯ (лац. deductio вывядзенне), спосаб вывядзення заключэнняў з насылак па законах логікі; адзін з метадаў пошукаў адзінкавага, канкрэтнага ў агульным. Менш строга Д. можна вызначыць як вывад ад агульнага да прыватнага, што дае дакладныя вынікі.

Як метад навук. пазнання шырока ўжываецца для пабудовы навук. тэорый. У якасці агульных прынцыпаў для дэдукцыйнага выводу выкарыстоўваюцца аксіёмы, што ляжаць у аснове сістэмы (гл. *Аксіяматычны метад*). Д. цесна звязана з індукцыяй. У сучаснай навуцы ўжываецца не толькі для пабудовы матэматыкі і логікі, як было да пач. 20 ст., а і для дэдукцыйнай пабудовы фізікі, біялогіі, сацыялогіі і інш. навук.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Полн. собр. соч., т. 29); Декарт Р. Рассуждение о методе, [пер. з франц.], [М.], 1953; Михайлова И. Б. Методы и формы научного познания, М., 1968; Пузиков П. Д. Аналитическая способность мышления, Мн., 1965.

ДЭЗ... (франц. dés...), прыстаўка, якая абазначае адмаўленне, знішчэнне (напр., *дэзінфекцыя*).

ДЭЗАКАРЫДЫЗАЦЫЯ (*дэз*...+грэч. akari клешч), знішчэнне кляшчоў і іх зародкаў. Д.

робяць пераважна *акарыцыдамі*. Гібелі клящчоў спрыяюць змены выпасаў і меліярацыя пашы. На Беларусі метадамі Д. ліквідаваны нуталіёз коней, кароста коней, буйн. раг. жывёлы і авечак; менш хварэе буйн. раг. жывёла на анаплазмоз і бабезіёз.

Літ.: Краткий курс паразитологии домашних животных, 6 изд., М., 1950.

ДЭЗАКТЫВАЦЫЯ (ад *дэз*...+лац. activus дзейсны), выдаленне радыеактыўных рэчываў з адзення, прадуктаў, баявой тэхнікі, збудаванняў, вады, паверхні зямлі і інш.

Спосаб Д. залежыць ад віду заражанай паверхні ці аб'екта. Пры Д. глебы здымаюць ле верхні пласт, пераворваюць або засыпаюць незаражанымі матэрыяламі (пяском, глінаю, шлакам); асфальтаваныя, металічныя, гумавыя і пафарбаваныя паверхні змываюць вадою, газай; адзенне вытрэсваюць, мыюць; прадукты механічна ачышчаюць, мыюць; ваду адстойваюць, фільтруюць ці перагоняюць. Д. ажыццяўляецца насельніцтвам і войскамі паводле рашэння камандавання і органаў грамадз. абароны.

Літ.: Гл. пры арт. *Засцярога ад зброі масавага паражэння.* *В. А. Гарохаў.* Мінск.

ДЭЗЕРЦІРСТВА (ад лац. desertor уцякач), самавольнае пакіданне ваеннаслужачымі вайсковай часці або месца службы, каб ухіліцца ад вайсковай службы. Асабліва небяспечнае ў ваенны час. Караецца ў крымін. парадку. У арміях бурж. краін, якія выкарыстоўваюцца для захопу чужых тэрыторый, задушэння нац.-вызв. руху, Д.— звычайная з'ява.

Літ.: Хан-Магомедов Д. О. Ответственность за воинские преступления, М., 1959.

ДЭЗІНВАЗІЯ (*дэз*...+лац. invasio напад), знішчэнне паразітаў жывёльнага паходжання. Уключае масавае аздараўленне людзей і жывёл ад інвазійных хвароб, знішчэнне пераносчыкаў і прамежкавых гаспадароў паразітаў, ачыстку вонкавага асяроддзя (пашы, ваданоі, памяшканні, гной) ад зародкаў паразітаў.

У СССР праведзена аздараўленне коней ад злучной хваробы, коней і вярблюдаў ад су-аўру, буйн. раг. жывёлы і авечак ад авадзнёвых хвароб (у некат. абласцях). У БССР праведзена аздараўленне курэй ад давеніёзаў і раетынёзаў, паспяхова ажыццяўляецца прафілактыка дыктыякаўлёзу цялят ізаляванай гадоўлі маладняку. Распрацоўваюцца метады Д. у Бел. н.-д. вет. ін-це і у Віцебскім вет. ін-це.

Літ.: Антипин Д. Н. и др. Паразитология и инвазионные болезни сельскохозяйственных животных, 3 изд., М., 1964.

ДЭЗІНСЕКЦЫЯ (*дэз*...+лац. insectum насякомае), знішчэнне шкодных насякомых. Д. робяць супраць узбуджальнікаў і пераносчыкаў інфекц. хвароб чалавека, жывёл і раслін, свірнавых шкоднікаў і інш.

Адрозніваюць Д. медыцынскую, ветэрынарную і сельскагаспадарчую. Мерапрыемствы па Д. падзяляюцца на прафілактычныя (стварэнне ўмоў, неспрыяльных для жыцця і размнажэння насякомых) і знішчальныя (знішчэнне насякомых на ўсіх стадыях развіцця). Метады Д.: механічныя (пасткі, сеткі, ачыстка фермаў і тэрыторый); фізічныя (дзеянне высокіх і нізкіх т-р); хімічныя (атрутныя для насякомых рэчывы — *інсектыцыды*); біялагічныя (полавая стэрылізацыя, выкарыстанне прыродных ворагаў насякомых — птушак, рыб, бактэрый, вірусаў, грыбоў). Біял. метады Д. распрацоўваюцца ў Бел. н.-д. вет. ін-це, Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы. Бел. н.-д. вет. ін-т увёў раннюю хіміяпрафілактыку скурна-авадзнёвых хвароб буйн. раг. жывёлы, у выніку колькасць хворых жывёл на Беларусі паменшала ў 10 разоў.

Літ.: Эпидемиология, 2 изд., М., 1968; Аргинский Н. И. Насекомые и клещи, вредящие сельскохозяйственным животным, М., 1962; Андреев К. П. Ветеринарная энтомология и дезинсекция, М., 1966. *М. І. Дылько.* Мінск.

ДЭЗІНФАРМАЦЫЯ (*дэз*...+франц. information інфармаванне), распаўсюджванне заведама непраўдзівай інфармацыі.

Наўмысная Д. шырока карыстаюцца органы капіталіст. прапаганды, каб увесці ў зман грамадскую думку. Прыёмы Д.: хлусня, фальсіфікацыя фактаў, падтасоўка і тэндэнцыйны падбор цытат, выказванняў, падача толькі выгаднай часткі праўды, накіраванне людской увагі надуманымі эфектамі ўбок ад ісціны, каб не выкрыліся сапраўдныя мэты правячых колаў. Асабліва вядз. памеры Д. набывае ў час войнаў для дэзарыентацыі праціўніка. Капіталіст. прэса, радыё, тэлебачанне і агенцтвы друку, карыстаючыся прыёмамі Д., стараюцца, напр., утаіць сапраўдны агрэс. характар вайны ЗША ў Індакітаі, сеюць падман, выдаюць Ізраіль — ахвяру «агрэсіўных» арабаў, неаколаніялізм у краінах Афрыкі, Азіі і Лац. Амерыкі выдаюць як «дапамогу» і «клопаты» пра развіццё маладых дзяржаў і інш. Прыёмамі Д. шырока карыстаюцца *Інфармацыйнае агенцтва ЗША* (ЮСІА), яго радыёвяшчальная служба *«Голас Амерыкі»*; *Брытанская радыёвяшчальная карпарацыя* (Бі-Бі-Сі), радыёстанцыя *«Свабода»* (ФРГ) і інш. *М. Ф. Дубянецкі.* Мінск.

ДЭЗІНФЕКЦЫЙНАЯ СТАНЦЫЯ, санітарна-процізпідэмічная ўстанова, якая ажыццяўляе сістэму мер па знішчэнні ўзбуджальнікаў інфекцыйных хвароб чалавека і жывёл. Праводзіць прафілактычную і процізпідэмічную *дэзінфекцыю*; эвакуацыю інфекцыйных хворых і падазроных на гэтыя хваробы; санітарную апрацоўку людзей, якія былі ў кантакце з інфекцыйнымі хворымі; кантроль за станам дэзінфекц. тэхнікі і правядзеннем штодзённай дэзінфекцыі лячэбна-прафілактычнымі ўстановамі; падрыхтоўку спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі па дэзінфекцыйнай справе.

Першыя Д. с. адкрыты ў Адэсе (1874), Пецярбурзе (1879). У Мінску ў 1930. Асн. структурныя аддзяленні Д. с.: эвакуацыі інфекцыйных хворых і ачаговай дэзінфекцыі; камернай дэзінфекцыі і сан. апрацоўкі; прафілактычнай дэзінфекцыі; лабараторыя.

Літ.: Гандельсман Б. И. и Рыжов А. А. Организация дезинфекционного дела в СССР, М., 1956; Баткис Г. А. и Лекарев Л. Г. Социальная гигиена и организация здравоохранения, М., 1969.

ДЭЗІНФЕКЦЫЙНЫЯ СРОДКІ, гл. *Антысептычныя сродкі.*

ДЭЗІНФЕКЦЫЯ (*дэз*...+лац. infectio заражэнне), знішчэнне ўзбуджальнікаў інфекцыйных хвароб у вонкавым асяроддзі. Пры падазронні на ачаг інфекцыі робяць прафілакт. Д.; калі ёсць хворы ці бактэрыяносьбіт — бягучую Д., пасля іх выдалення з памяшкання — заключную Д.

Выкарыстоўваюць фізічныя (кіпячэнне, абпальванне, апрацоўка парай пад ціскам, ультрафіялетавым і радыяцыйным выпрамяненнямі і інш.), хімічныя (хларамін, хлорная вапна, фармалін, фенол, кіслоты, шчолачы), біялагічныя (бактэрыяфагі, фільтры) дэзінфекцыйныя сродкі. Ужываюцца з дапамогаю тэхн. прыстасаванняў (аўтаклавы, апрамяняльнікі, гідрапульты).

Літ.: Вашков В. И. Дезинфекция, дезинсекция и дератизация, 2 изд., М., 1956.

ДЭЗОКСІКОРТЫКАСТЭРОН-АЦЭТАТ (дэзоксікортыкастэрон, картат, картырон), сінтэтычнае рэчыва, падобнае па прыродны гармон кары надныракавікаў. Рэгулюе водны абмен і баланс іонаў натрыю і калію, павышае артэрыяльны ціск, паскарае сінтэз бялкоў. Выпускаюць у ампулах (мае 0,5%

алею). Уводзяць у мышцы пры адысонавай хваробе, зніжэнні функцыі надныракавікаў, гіпатаніі.

Літ.: Машковский М. Д. Лекарственные средства, ч. 1, 6 изд., М., 1967.

ДЭЗОКСІРЫБАНУКЛЕІНАВАЯ КІСЛАТА (ДНК), біяпалімер, складзены з нуклеатыдаў, якія маюць у сваім саставе дэзоксірыбозу; неабходная састаўная частка жывой матэрыі. Спецыфіка будовы ДНК абумоўлівае спадчынную перадачу прыкмет і ўласцівасцей большасці арганізмаў і сінтэз спецыфічных кожнаму арганізму бялкоў.

Малекулярная маса пераважна 4—16 млн., можа дасягаць 100—200 млн. Малекулы ДНК усіх арганізмаў пабудаваны па адным тыпе. Паводле тэорыі амер. і англ. вучоных Дж. Д. Уотсана і Ф. Х. Крыка (1953), яны складаюцца з двух спіральна закручаных адзін вакол аднаго поліпептыдных ланцугоў. Нуклеатыды маюць пентозу дэзоксірыбозу, злучаную з фосфарнай к-той і азоцістай асновай (адэнінам, гуанінам, тымінам або цытазінам). У полінуклеатыдзе рэшткі фосфарнай к-ты злучаюць суседнія нуклеатыды, утвараючы складаныя эфіры са спіртавымі групамі 3-га нуклеатыду і 5-га вугляроднага атама суседняга нуклеатыду. Малекулы ДНК адрозніваюцца паміж сабою паслядоўнасцю 4 азоцістых асноў (астатняя частка малекулы ва ўсіх ДНК аднолькавая). Два ланцугі ДНК звязаны вадародными сувязямі, якія злучаюць папарна (з розных ланцугоў) адэнін з тымінам і гуанін з цытазінам. Гэта забяспечвае і механізм аўтарэпрадукцыі (самападваення) малекул. Пры разрыве вадародных сувязей спіраль малекулы ДНК разыходзіцца. На кожным адзіночным ланцугу, як на матрыцы, сінтэзуецца дадатковы (камплементарны) ланцуг, зборка якога ідзе ў залежнасці ад паслядоўнасці нуклеатыдаў зыходнага ланцуга (адэнін прыцягваецца толькі да тыміну і наадварот; такая ж сувязь гуаніну з цытазінам). У выніку 2 утвораныя малекулы ДНК маюць такі нуклеатыдны састаў, як і зыходная. Гл. таксама *Біясінтэз, Ген, Нуклеінавыя кіслоты, Рэплікацыя, Спадчыннасць.*

Літ.: Биосинтез белка и нуклеиновых кислот, М., 1965 (бібліягр.); Бреслер С. Е. Введение в молекулярную биологию, 2 изд., М.— Л., 1966; Дубинин Н. П. Молекулярная генетика и действие излучений на наследственность, М., 1963; Уотсон Дж. Молекулярная биология гена, пер. с англ., М., 1967; Нуклеиновые кислоты, под ред. А. Н. Белозерского, пер. с англ., М., 1965.

С. І. Васількевіч. Мінск.

ДЭЗУРБАНІЗМ (ад *дэз*...+лац. urbanus гарадскі), кірунак у горадабудаўніцтве капіталістычных краін 20 ст., які адмаўляе станоўчую ролю вялікіх гарадоў як цэнтраў прамысловага, грамадскага жыцця, навукі і культуры, найб. эканамічных формаў рассялення і прапаведуе разгрупаванне насельніцтва за іх межамі.

Узнікненне і развіццё Д. звязана з абвастрэннем супярэчнасцей паміж горадам і вёскай і крыцыяльных утопіях пач. 19 ст. (невял. камуны ў прыродным навакольлі). У канцы 20-х г. 20 ст. ідэі Д. зрабілі ўплыў на творчасць некаторых сав. архітэктараў (М. Гінзбург, М. Баршч і інш.); у тэарэт. артыкулах сацыёлага М. Ахітовіча прапагандавалася стужачная жылая забудова ўздоўж аўтастрад з індывідуальнымі дамамі на аднаго чалавека. Найб. паслядоўна ідэі Д. развіваліся ў кнізе амер. арх. Ф. Л. Райта «Горад, які знікае» (1932) і ў яго праекце горада (1935), дзе меркавалася размяшчаць жылыя і грамадскія збудаванні сярод с.-г. угоддзяў.

ДЭІЗМ (ад лац. deus бог), рэлігійна-філасофскае вучэнне, якое прызнае бога як першапрычыну свету, але адмаўляе яго штодзённае ўмяшанне ў жыццё прыроды і грамадства. Узнік у Англіі.

Прыхільнікамі Д. ў розных краінах былі матэрыялісты (Вальтэр, Т. Гобс, Дж. Лок, І. Ньютан) і ідэалісты (Г. В. Лейбніц, І. Кант). Ва ўмовах панавання феад.-царкоўнага светапогляду быў нярэдка скрытай формай атэізму. Да сярэдзіны 19 ст. ператварыўся ў рэакц. сістэму, якая імкнецца прымірыць веру ў бога з развіццём навукі.

ДЭЙМАС, спадарожнік планеты Марс, адкрыты ў 1877 амер. астраномам А. Холам. Дыяметр 8 *км*, сярэдняя адлегласць ад планеты 23 500 *км*, перыяд абарачэння вакол Марса 30 *гадз* 18 *мін*. Гл. таксама *Спадарожнікі планет.*

ДЭЙТРОН (дэйтэрон, дэйтон), ядро атама цяжкага ізатопа вадароду — *дэйтэрыю*. Ат. маса каля 2. Складаецца з 1 пратона і 1 нейтрона і з'яўляецца самай простай сістэмай, звязанай *ядзернымі сіламі*.

ДЭЙТЭРЫЙ, цяжкі вадарод ^2H (Deuterium), D, ізатоп вадароду з масавым лікам 2. Адкрыты ў 1932. Ужываецца як запавольнік нейтронаў у ядзерных рэактарах і як ядзернае паліва. *Дэйтроны*, ядры атамаў Д., выкарыстоўваюцца як мішэнь у многіх ядзерных рэакцыях.

ДЭКАДЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА І ЛІТАРАТУРЫ ў Маскве, паказы дасягненняў беларускага мастацтва і літаратуры.

Першая дэкада адбылася 5—15.6.1940. Удзельнікі: Бел. т-р оперы і балета («Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага, «У пушчах Палесся» А. Багатырова, «Кветка шчасця» А. Туранкова, «Салавей» М. Крошнера), БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы; «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка, «Апошнія» М. Горкага), сімфанічны аркестр і аркестр народных інструментаў, ансамбль бел. нар. песні і танца; ансамблі песні і танца БВА і пагранічных войск НКУС БССР; самадзейныя калектывы — Азершчынскі і Падлескі калгасныя хоры, Гомельскі танц. калектыў Палаца культуры чыгуначнікаў. Наладжваліся вечары бел. літаратуры, выстаўка выяўл. мастацтва, прагляды бел. фільмаў («Балтыйцы», «Адзінаццатага ліпеня», «Вогненныя гады» і інш.). Адбыліся нарады па пытаннях развіцця бел. л-ры, па драматургіі, т-ры і кіно праўлення СП СССР з удзелам бел. пісьменнікаў.

Другая дэкада адбылася 11—21.2.1955. Удзельнікі: Бел. т-р оперы і балета («Дзяўчына з Палесся» Цікоцкага, «Страшны двор» С. Манюшкі, «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага, «Палымяныя сэрцы» В. Залатарова), т-р імя Я. Купалы («Паўлінка» Я. Купалы, «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, «Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка, «Даходнае месца» А. Астроўскага), т-р імя Я. Коласа («Несцерка» В. Вольскага, «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Ворагі» М. Горкага), Дзярж. рус. т-р БССР («Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «Варвары» М. Горкага, «Кароль Лір» У. Шэкспіра), Дзярж. хор БССР, Бел. нар. хор, сімф. і нар. аркестры Бел. філармоніі, Ансамбль песні і танца БВА, Маладзечанскі ансамбль песні і танца, самадзейныя калектывы — Гомельскі танц. калектыў Палаца куль-

туры чыгупачнікаў, танц. калектыў працоўных рэзерваў БССР. Адбылася выстаўка выяўл. мастацтва і нар. творчасці БССР, кнігі і графікі, прагляд бел. фільмаў («Канстанцін Заслонаў», «Паўлінка», «Пяюць жаваранкі», «Дзеці партызана», «Хто смяецца апошнім» і інш.), абмеркаванне твораў бел. л-ры. Дэкадам папярэднічалі паказы ў Маскве ў 1923, 1930 і 1931 (у 1923 на Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы — батлейка і спектаклі т-ра БДТ-1 «На купалле» М. Чарота, «Машэка» Е. Міровіча, «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча; у 1930 на Усесаюзнай алімпіядзе нац. т-раў — спектаклі т-ра БДТ-1 «Гута» Р. Кобеца, «Міжбур'е» Дз. Курдзіна і Дзярж. яўр. т-ра БССР «Глухі» Д. Бергельсона, «Авечая крыніца» Лопэ дэ Вэгі; у 1931 у час тыдня бел. культуры — спектаклі т-ра БДТ-1 «Гута» Кобеца і «Ярасць» Я. Яноўскага). Гл. таксама *Дэкады літаратуры і мастацтва*.

Літ.: Искусство Советской Белоруссии, М.—Л., 1940; Декада белорусского искусства и литературы в Москве, Мн., 1955. *А. В. Сабалеўскі*. Мінск.

ДЭКАДЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА, агляды дасягненняў літаратуры і мастацтва народаў СССР, што сістэматычна наладжваліся ў Маскве. Да 1950 дэкады л-ры і дэкады мастацтва праводзіліся паасобку, у 1950—60 аб'яднана. Спрыяліі развіццю шматнацыянальных л-р і мастацтваў, сацыялістычных зместам і нацыянальных формаю. У дэкадах з творчымі справаздачамі выступалі оперныя і драм. тэатры, прафес. і самадзейныя аркестры, ансамблі песні і танцаў, хоры, кінастудыі, выдавецтвы, пісьменнікі, артысты, мастакі, кампазітары, майстры нар. творчасці. Працавалі выстаўкі выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і нар. мастацтва, кнігі, дэманстраваліся кінафільмы. Адбываліся літ. вечары, канцэрты, абмеркаванні твораў пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў, спектакляў. З 1960 агляды дасягненняў л-р і мастацтваў народаў СССР становяцца больш разнастайныя і набываюць характар узаемнага культурнага абмену саюзных і аўт. рэспублік, краёў, абласцей, гарадоў. У рэспубліках праводзяцца мясцовыя дэкады і агляды нац. мастацтва і л-ры, прысвечаныя юбілейным датам устанаўлення Сав. улады, Камуністычнай партыі, рэвалюцыі, гадавінам з дня нараджэння У. І. Леніна, абласныя агляды-конкурсы маст. самадзейнасці, рэсп. мастацкія выстаўкі, фестывалі і г. д.

КАЛЯНДАР ДЭКАД МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

Укр. (сак. 1936), каз. (май 1936), груз. (студз. 1937), узб. (май 1937), азерб. (крас. 1938), кірг. (май — чэрв. 1939), арм. (кастр. 1939), бел. (чэрв. 1940, гл. *Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры* ў Маскве), бурат-манг. (кастр. 1940), тадж. (крас. 1941), малд. (снеж. 1949).

КАЛЯНДАР ДЭКАД ЛІТАРАТУРЫ Ў МАСКВЕ

Арм. (май 1941), груз. (1944), туркм. (вер. 1946), літ. (люты — сак. 1948), лат. (снеж. 1948), бел. (студз. 1949), каз. (май 1949), тадж. (вер. 1949), эст. (май — чэрв. 1950).

КАЛЯНДАР ДЭКАД ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

Азерб. (ліст.— снеж. 1950), укр. (чэрв. 1951), узб. (ліст. 1951), літ. (сак. 1954), бел. (люты 1955, гл. *Дэкады беларускага мастацтва і літаратуры* ў Маскве), башк. (май — чэрв. 1955), туркм. (кастр. 1955), лат. (снеж. 1955), арм. (чэрв. 1956), эст. (снеж. 1956), тадж. (крас. 1957), тат. (май — чэрв. 1957), каб.-балк. (чэрв.— ліп. 1957), адыг. і карачаева-чаркес. (кастр. 1957), як. (снеж. 1957), груз. (сак.— крас. 1958), кірг. (кастр. 1958), каз. (снеж. 1958), узб. (люты 1959), азерб. (май 1959), карэльскай (жн.— вер. 1959), бур. (ліст.— снеж. 1959), даг. (крас. 1960), малд. (май — чэрв. 1960), паўн.-асецін. (жн.— вер. 1960), укр. (ліст. 1960).

КАЛЯНДАР ДЭКАД, ТЫДНЯЎ, ДЗЁН ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА НАРОДАЎ СССР НА БЕЛАРУСІ

Тыдзень укр. л-ры (чэрв. 1957), Дэкада бел. музыкі, прысвечаная 40-годдзю Кастр. рэв. (ліст.— снеж. 1957), Тыдзень літоўскай л-ры (май 1958), Дэкада бел. самадзейнага мастацтва, прысвечаная 40-годдзю БССР і КПБ (Мінск, ліст. 1958), Дэкада бел. мастацтва, прысвечаная 40-годдзю БССР і КПБ (снеж. 1958 — студз. 1959), Тыдзень латышскай л-ры (вер. 1959), Тыдзень дружбы літоўскага і бел. народаў у Пастаўскім р-не БССР і Швенчонскім р-не Літ. ССР (крас. 1960), Тыдзень малд. л-ры (вер. 1960), Тыдзень рус. л-ры (жн. 1961), Дэкада самадзейнага мастацтва БССР (Мінск, снеж. 1962), Тыдзень літоўскай кнігі (вер. 1963), Дэкада рус. мастацтва (студз. 1965), 3-я Дэкада нар. творчасці БССР (Мінск, сак. 1965), Тыдзень тадж. л-ры (кастр. 1966), Дэкада узб. л-ры і мастацтва (чэрв. 1967), Дні (у Мінску) мастацтва абласцей БССР, прысвечаныя 50-годдзю БССР і КПБ: Брэсцкай (вер. 1968), Віцебскай і Гомельскай (кастр. 1968), Гродзенскай і Магілёўскай (ліст. 1968), Мінскай (снеж. 1968), Дні літоўскай л-ры ў Гродзенскай вобл. (сак. 1969), Дні л-ры РСФСР (кастр. 1969), Дэкада мастацтваў народаў СССР, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна (1970), Дні бел. л-ры ў абласцях: Брэсцкай і Віцебскай (ліст. 1970), Гомельскай і Магілёўскай (люты 1971), Гродзенскай (сак. 1971), Мінскай (крас. 1971).

КАЛЯНДАР ДЭКАД, ТЫДНЯЎ, ДЗЁН БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА Ў РЭСПУБЛІКАХ


Тыдзень бел. л-ры ў Малдавіі (чэрв. 1956), Тыдзень бел. л-ры на Украіне (вер. 1957), Тыдзень бел. л-ры ў Літве (вер. 1958), Дэкада бел. л-ры ў Латвіі (вер. 1960), Тыдзень бел. кнігі ў Літве (кастр. 1962), Дні бел. л-ры ў РСФСР (ліп. 1964), Тыдзень бел. л-ры ў Таджыкістане (ліст. 1965), Дэкада бел. л-ры і мастацтва ў Узбекістане (крас. 1966), Дні культуры і маст. БССР у Маскве (1967), Тыдзень бел. л-ры ў Ленінградзе (чэрв. 1968), Дні бел. л-ры і маст. ў Маскве, прысвечаныя 50-годдзю БССР і КПБ (снеж. 1968), Дні бел. культуры ў Ульянаўску (май 1969), Дэкада бел. л-ры, прысвечаная XXIV з'езду КПСС (Магнітагорск, сак. 1971).

І. У. Саламевіч. Мінск.

ДЭКАДЭНЦТВА (ад франц. décadence заняпад), агульная назва ўпадніцкіх з'яў у бурж. культуры эпохі імперыялізму.

Крайняе абвастрэнне сацыяльных і перш-наперш класавых супярэчнасцей, уласцівае гэтаму перыяду развіцця бурж. грамадства, выклікае разкае проціпастаўленне асобы грамадству. Чалавек дэгуманізуецца. Адсюль настрої адзіноты, бяссэнсавасці існавання, пагоня за пачуццёвымі асалодамі і адначасова востры страх смерці, пасіўны індывідуалізм і амаралізм. Гэта выяўляецца ў духоўным жыцці бурж. грамадства, у яго філасофіі, л-ры і мастацтве. У філасофіі пераважаюць суб'ектывізм і ідэалізм, адмаўленне пазнавальнасці свету, містыка. У л-ры і мастацтве гэтыя рысы выступаюць найбольш выразна і абазначаюцца словам Д. ў больш вузкім гісторыка-літ. і гісторыка-маст. яго значэнні. Глыбокая разарванасць свядомасці і проціпастаўленне пачуцця розуму ў працэсе стварэння маст. вобраза садзейнічаюць таму, што рэчаіснасць успрымаецца мастаком як мноства выпадковых, пазбаўленых унутранага сэнсу, не звязаных паміж сабою фактаў, з'яў, адчуванняў і, наадварот, як сукупнасць нейкіх тагасветных, звышпачуццёвых сутнасцей, дастасоўна да якіх






Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва І. 1. У. С. Мурахвер. Шкловыдзімальшчыкі. Фрагмент. Каванае жалеза, каляровае шкло. Шклозавод «Нёман». 1968. ВДНГ БССР. 2. Л. М. Мягкова. Карагод. Каляровае шкло. Шклозавод «Нёман». 1969. Дзярж. маст. музей БССР. 3. Ю. М. Любімаў. Зубр. Чаканка, эмаль. 1969. Дзярж. маст. музей БССР.



1



2



Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва II.

1. М. А. Прыходзька, Я. С. Барсукова, Е. Я. Суглоб. Неглюбскія ручнікі (Гомельскі р-н). Ткацтва. 1969—70. Дзярж. маст. музей БССР.
2. Слуцкі пояс 2-й пал. 18 ст. Дзярж. маст. музей БССР.
3. У. М. Федаровіч. Дыван «Свята ўраджаю». Воўна. 1962. Віцебскі дывановы камбінат.


3



1



2



Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва III.


1. Л. Я. Багданаў. Карусель. Шамот, глазура. 1965. Дзярж. маст. музей БССР.
2. К. Г. Арцёменка. Масленіца. Саломка. 1970.
3. А. Р. Такарэўскі, М. І. Семанькоў. Спарыш, збан і міса (Пружаны, Дуброўна). Чорнаглянцаваная і задымленая кераміка. 1969. Рэспубліканскі дом народнай творчасці. Мінск.
4. В. А. Леантовіч. Сервіз «Сувенірны». Фарфор. 1970. Мінскі фарфоравы завод.

3




4







Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва IV. 1. М. М. Пушкар. «Палешукі». Кераміка. 1968. Рэспубліканскі дом народнай творчасці, Мінск. 2. П. Ц. і Т. М. Даўгеры. Огаўскія куфры. Роспіс па дрэве. 1970. Дзярж. маст. музей БССР. 3. Б. І. Захараў, Э. У. Крыловіч, Г. М. Сцепурко. Гарнітур мэблі «Алеся». 1969. Эксперым.-канструктарскае бюро мэблі, Мінск.



пачуццёвыя факты выступаюць як таямнічыя сімвалы. Цэласнасць маст. вобраза ў выніку парушаецца, змест і форма ў ім уступаюць у супярэчнасць. Гэта спецыфічна выяўляецца ў кожным канкрэтным відзе мастацтва: у л-ры — *сімвалізм*, крайнія формы *натуралізму*, у выяўленчым мастацтве — *абстракцыянізм*, *сюррэалізм*, *ташызм* і інш., у музыцы — «канкрэтная» музыка, *дадэкафонія*, у архітэктуры — *мадэрн*, бруталізм. Гл. таксама *Мадэрнізм*.

Літ.: Ленін У. І. Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура, Тв., т. 10 (Поли. собр. соч., т. 12); Плеханов Г. В. Искусство и общественная жизнь, у яго кн.: Литература и эстетика, т. 1, М., 1958; яго ж. Евангелие от декаданса, там жа, т. 2, М., 1958; Горький М. Поль Верлен и декаденты, Собр. соч., т. 23, М., 1953; яго ж. Разрушение личности, там жа, т. 24, М., 1953.

М. І. Крукоўскі, Мінск.

ДЭКАЛЬКАМАНІЯ (франц. décalcomanie), спосаб вырабу пераводных выяў (дзіцячых малюнкаў, этыкетак, маркіровак) літаграфскім друкаваннем іх на паперы, загрунтаванай клеявым слоем (гл. *Літаграфія*).

Выявы, вробленыя спосабам Д., можна наносіць на дрэва, метал, шкло, фарфор і інш. Для пераносу выяву размочваюць або разаграюць; клеявы грунт пры гэтым раствараецца, а фарбавая плёнка аддзяляецца ад падкладкі і астаецца на вырабе.

ДЭКАМПРЭСІЙНАЯ ХВАРОБА, хвароба вадалазаў, лётчыкаў і касманаўтаў ад хуткага пераходу з асяроддзя з павышаным атмасферным ціскам у асяроддзе з больш нізкім і ўтварэння ў крыві і тканках арганізма пухірыкоў газу, якія выклікаюць комплекс паталагічных змен. Гл. *Прафесійныя хваробы*.

ДЭКАПІРАВАННЕ (ад франц. décaper ачышчаць метал), выдаленне з паверхні металічных вырабаў плёнкі акісламі траўленнем слабымі растворамі кіслаты ці цыяніду.

Пры Д. адбываецца хім. актывізацыя паверхневага слоя металу, што неабходна для наступнага *аксідавання металаў* ці *пасівіравання металаў*. Пашырана Д. ў гальванатэхніцы; робіцца перад электралітычным пакрыццём метал. вырабаў для моцнага счаплення металаў. Д. ўжываецца таксама перад халоднай штампоўкай стальных вырабаў, каб змяць акаліну з паверхні і павялічыць выцяжку.

ДЭКАРАТЫЎНАЕ МАСТАЦТВА (ад лац. decoro упрыгожваю), галіна прасторавых мастацтваў, якія разам з архітэктурай фарміруюць эстэтычнае асяроддзе чалавека. Да сферы Д. м. адносяцца стварэнне мастацкіх твораў, якія аб'ядноўваюцца часткай арх. збудаванняў ці комплексу (плошчы, вуліцы, будынка, інтэр'ера), і маст. апрацоўка утылітарных рэчаў і тых, што ўпрыгожваюць быт чалавека. Паводле задач Д. м. падзяляецца на манумент.-дэкаратыўнае, дэкаратыўна-прыкладное, афармленчае (гл. адпаведныя арт.). Асобным раздзелам Д. м. з'яўляецца навукова абгрунтаванае маст. канструяванне інтэр'ера, машын і бытавых рэчаў для іх прамысл. вытворчасці (гл. *Мастацкае канструяванне*).

У адрозненне ад твораў *станковага мастацтва*, разлічаных на ўспрыманне без сувязі з іх акружэннем, творы Д. м. ствараюцца як элемент або дэталь ансамбля (гарадскога, паркавага, інтэр'ера, касцюма і г. д.), актыўна ўдзельнічаюць у яго маст. аб'ёмна-прасторавай арганізацыі і толькі ў ансамблі цалкам раскрываюць свой ідэйна-эмацыянальны змест. Д. м. ўжывае выразныя сродкі, (пластычная форма, маштаб, прапорцыі, рытм, фактура матэрыялу, колер), шырока выкарыстоўвае арнамент.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА, мастацтва стварэння бытавых прадметаў, якія маюць эстэтычныя якасці і прызначаны не толькі задавальняць практычныя патрэбы, але і аздабляюць жыллё, архітэктурныя збудаванні, паркі, адзенне і г. д.; раздзел *дэкаратыўнага мастацтва*. Да Д.-п. м. адносяцца *мэбля*, хатняе пачынне, *шпалеры*, *дываны*, *вышыўка*, *карункі*, *адзенне*, *посуд*, асвятляльныя і настольныя прылады, па-мастацку аздобленая зброя, сродкі перамяшчэння, гадзіннікі, *цацкі*, дробная скульптура, ювелірныя вырабы (гл. *Ювелірнае мастацтва*). Д.-п. м. класіфікуецца паводле матэрыялу — дрэва, метал, *кераміка*, *шкло*, тэкстыль (гл. *Тканіны мастацкія*), і паводле тэхнікі выканання — разьба (гл. *Разьба мастацкая*), роспіс (гл. *Роспіс дэкаратыўны*), *набойка*, коўка (гл. *Коўка мастацкая*), *чаканка*, ліццё (гл. *Ліццё мастацкае*), пляценне і інш. Д.-п. м., як і архітэктура, мае дачыненне да вытворчасці матэрыяльных і маст. каштоўнасцей (гл. *Мастацкая прамысловасць*). У адрозненне ад станковага мастацтва творы Д.-п. м. не трацяць сувязі з утылітарнай функцыяй рэчы, яны поўнасцю выяўляюць свой вобразна-маст. змест толькі ва ўзаемадзеянні з навакольлем (арх. асяроддзем і інш.), успрымаюцца ва ўзаемасувязі з інш. прадметамі ці іх комплексамі (сервіз, гарнітур мэблі, касцюм). Пашыраны прамежкавыя формы паміж Д.-п. м. і станковым мастацтвам (*пано*, *габелены*, *плафоны*, дэкар. статуі). Сюжэтныя матывы, якія ўжываюцца ў Д.-п. м., цесна звязаны з дэкар. задачамі, іх трактоўка абумоўлена прызначэннем рэчы, асаблівасцямі матэрыялу і тэхнікі, патрабаваннямі ансамбля. Сродкі вынўл. мастацтваў (скульптуры, жывапісу, графікі) і *арнамент* выкарыстоўваюцца ў Д.-п. м. не толькі для стварэння дэкору (які не абавязкова з'яўляецца элементам твора Д.-п. м.), але часам пранікаюць і ў форму прадмета, істотна ўплываючы на яго вобразную структуру (дэталі мэблі ў выглядзе звярыных лап, галоў, пальмет; посуд у выглядзе кветкі, плода, птушкі, звера, чалавека). Часам арнамент ці выява служаць асновай формаўтварэння вырабу (узор аграджы, карункаў, малюнак вышыўкі). У прадметах чыста утылітарнага характару дэкор часта адсутнічае і эстэт. якасць дасягаецца выразнасцю набудовы формы вырабу, якая падкрэслівае яго прызначэнне. Таму паказ прыгажосці фактуры матэрыялу (што таксама ўплывае на характар формы прадмета) — актыўны сродак эстэт. ўздзеяння. У адзінстве мастацкай і утылітарнай функцыі, на ўзаемапранікненні формы і дэкору выяўляецца сінтэтычны характар Д.-п. м.


Д.-п. м. ўзнікла ў час вылучэння рамяства ў асобную галіну вытворчасці і на працягу многіх стагоддзяў развівалася ў народным асяроддзі ў форме нар. маст. рамёстваў (гл. *Промыслы народные*). Яно прайшло шэраг этапаў развіцця і змены маст. формаў і стыляў. У многіх плямёнаў і народнасцей Д.-п. м. было асн. галіною маст. творчасці. З вылучэннем племяннога знаці, а пазней — нашчадкам антаган. класаў у Д.-п. м. (якое абслугоўвала патрэбы пануючых колаў) усё большае значэнне

аддавалася эстэтыцы багацця матэрыялу і дэкору, іх рэдкасці і вытанчанасці. Вылучаюцца асабліва каштоўныя вырабы (прадметы для культавых ці прыдворных цырымоній, убрання палацаў), у якіх бытавал мэтазгоднасць прыносіцца ў ахвяру дзеля павелічэння іх эмацыянальнага ўплыву. Эклектызм маст. культуры капіталізму выклікаў паяўленне па-мастацку вырашанага, а ўпрыгожанага прадмета, у якім страчаны сувязі паміж формай і дэкорам, абеднены эстэт. якасці і вобразна-эмацыянальны вмест. Мастакі спрабавалі проціпаставіць засіллю безгустоўпасці і абмежаванага ўздзеяння на Д.-п. м. масавай машыннай вытворчасці унікальныя прадметы, зроблены паводле іх праектаў ва ўмовах рамесніцкай (У. Морыс у Англіі, «Дармштацкая калонія мастакоў» у Германіі) ці фабрычнай («Нямецкі Веркбунд») працы. Але гэта не магло істотна змяніць становішча. Новыя магчымасці для развіцця Д.-п. м. дала Вял. Кастр. рэвалюцыя. Задача стварэння па-мастацку змястоўнага асяроддзя для працы і побыту самых шырокіх мас стымулявала творчыя пошукі ўсіх мастакоў у СССР (у т. л. «Прамысловага мастацтва»), стала галоўнай у творчасці прагрэс. мастакоў Д.-п. м. іншых краін («Баўхаўз» у Германіі). У СССР былі адроджаны старыя цэнтры Д.-п. м. (шырока вядомыя дываны Туркменіі і Азербайджана, кераміка РСФСР, Украіны, Прыбалтыкі, разьба па ганчы Узбекістана і Таджыкістана, маст. апрацоўка металу ў Грузіі і Дагестане і інш.), майстры аб'ядналіся ў маст. арцелі. У апошні час побач з пошукамі гранічна функцыянальных і па-мастацку выразных рэчаў (гл. *Мастацкае канструяванне*), якія вырабляюцца фабрычным спосабам, сав. мастакі вырабляюць унікальныя творы, у якіх эмацыянальнасць вобраза спалучаецца з багаццем прыёмаў апрацоўкі матэрыялаў.

На тэр. Беларусі помнікі Д.-п. м. (крамяныя фігуркі, арнаментаваная кераміка) сустракаюцца з каменнага веку. У раннім жалезным веку (прыкладна з 5 ст. да н. э.) паяўляюцца вырабы з бронзы і жалеза (бляхі, бранзалеты, падвескі, зашпількі, плеценыя паясы) (18 ст.), заткананыя залатымі і срэбранымі ніткамі. Росквіт Д.-п. м. адбыўся ў час Сав. улады. Пашыраны дробная пластыка, *інкрустацыя*, роспіс па дрэве (гл. *Озаўскія куфры*), маст. шкло (гл. *Нёманскае шкло*), вырабы з саломкі (гл. *Саломка мастацкая*), тканіны, дываны, *фарфор*. Гл. таксама арт. пра асобныя віды Д.-п. м.: *Арнамент, Бронза, Выпальванне па дрэве, Лакі мастацкія, Маёлika, Фаянс, Філігрань, Цісненне, Чэрнь, Эмаль*. Іл. гл. на ўкл.


Літ.: Аркин Д. Искусство бытовой вещи, М., 1932; Каган М. О прикладном искусстве, Л., 1961; Ченалов А. К. Основы понимания декоративно-прикладного искусства, М., 1962; Салтыков А. В. Избр. труды, М., 1962; Русское декоративное искусство, т. 1—3, М., 1962—65; Всеобщая история искусств, т. 1—6, М., 1956—66; Искусство и быт, в. 1—3, М., 1963—68; Панышина И. Н. Декоративно-прикладное искусство, Мн., 1963; Мастацтва Савецкай Беларусі (аўтар тэксту І. Панышына), Мн., 1968; Искусство стран и народов мира, т. 1—3, М., 1962—71; Салтыков А. В. Самое близкое искусство, М., 1968; Острой О. С. Изобразительное и прикладное искусство. Библиогр. рус. библиогр., М., 1969, с. 157—190.

ДЭКАРАТЫЎНЫЯ РАСЛІНЫ, дрэвы, кусты і травяністыя расліны (пераважна кветкавыя), якія выкарыстоўваюцца для ўпрыгожання населеных месцаў і жылых памяшканняў. На Беларусі больш за 300 відаў і сартоў.



Пёргала з павойных раслін.

Дэкаратыўнасць расліны вызначаецца іх памерамі, формаю кроны, будовай і колерам кветак, лісця, сцябла, узростам самой расліны. На Беларусі з мясцовых дрэўна-кустовых парод як дэкар. выкарыстоўваюцца бяроза бародаўчатая, клён вастралісты, ліпа, дуб, ясень, бярозa, каліна, рабіна, чаромха, бэз, ядловец і інш. З інтрадукаваных раслін ін-там эксперым. батанікі і Цэнтр. батанічным садам АН БССР прапанавана больш за 300 відаў. Сярод іх розныя віды елак, лістоўніц, піхтаў, хвояў, дубоў, клёнаў, арэхаў, бэзу, ружаў і інш. Д. р. высаджваюць уздоўж дарог і вуліц, выкарыстоўваюць для жывых агароджаў, куртын, рабатак, клумбаў, маляўнічых кампазіцый. Геаметрычна правільныя лінейныя або групавыя насадкі фарміруюць найчасцей дрэвамі з вузкаю кронаю (елка, піхта, туя, граб, некат. таполі). У адзіночных насадках ці ў вялікіх групах



Ядловец звычайны пірамідальны.

выкарыстоўваюцца дрэвы з шырокімі кронамі (арэх, клён, дуб і інш.). Па берагах вадаёмаў, на схілах, узгорках высаджваюць ніцыя і інш. разнасхілах, узгорках высаджваюць ніцыя і інш. разнавіднасці вярбы, бярозы, клёну, вольхі, ясеню, таполі, рабіны, акацыі. Павойнымі раслінамі (дзікачы вінаград, гарошак пахучы, фасоля, хмель, іпамея, кірказон, капрыфоль, брыёнія, тладыянта, настурка і інш.) упрыгожваюць альтанкі, тэрасы, сцены будынкаў. Для кветнікаў і аблясянення пасцежкаў выкарыстоўваюцца пераважна кветкавыя расліны: аднагадовыя — астры, ільвіны зеў, вербена, петунія, лятконія (мацыёла), пахучая табака і інш.; двухгадовыя — віёла, турэцкі гваздзік, незабудка, браткі і інш.; шматгадовыя — гладыялусы, крокусы, вярбіні, касачы, флёксы, каны, рудбекі, нарцысы, гіяцынты, лілеі. У ахоўным грунце вырошчваюць пальмы, фікусы, гартэнзіі, цыкламены, хрызантэмы і інш. Іл. гл. таксама на ўкл.

Літ.: Акимов П. А. Декоративные деревья и кустарники, М., 1963; Гроздов В. В. Декоративные кустарники, М., 1964; Мерло А. С. Советы цветоводам, Мн., 1967; Деревья и кустарники, розы и сирень, Мн., 1968.

Г. С. Мярло, А. А. Чахобскі. Мінск.

ДЭКАРАЦЫЙНАЕ МАСТАЦТВА, гл. *Тэатральна - дэкарацыйнае мастацтва, Дэкарацыя.*

ДЭКАРАЦЫЯ (ад лац. decoro упрыгожваю) у тэатры і кіно, афармленне трохмернай прасторы, у межах якой адбываецца дзеянне спектакля або фільма. Ствараецца з дапамогай архітэктуры, жывапісу, графікі, маст. планіроўкі месца дзеяння, спец. фактур, асвятлення і тэхнікі (гл. *Сцэна, Павільён*), а таксама праекцый. Існуе для вобразнай характарыстыкі гістар. абставін, умоў і атмасферы спектакля або фільма — асяроддзя, у якім дзейнічае акцёр.

Сістэмы тэатральных Д.: кулісная перасоўная Д.— мяккія навясныя кулісы або цвёрдыя на рухомых рамах, размешчаныя ад партала ўглыб сцэны (вядома з 1628); кулісна-арачная шад'ёмная Д.— жывапісныя палотны, зроблены з улікам перспектывы і сшытыя ў выглядзе аран (вядома з 17 ст.; разнавіднасць кулісна-арачнай — ажурная Д.— умацоўваецца на сетцы або апліцыруецца на цюлі); павільённая Д. складаецца са сценак-рам, зацягнутых пісаным палатном, перакрытых столлю (вядома з 1794); аб'ёмная Д.— камбінацыя плоскіх сцен і аб'ёмных дэталяў — станкоў, лесвіц, пандусаў і інш. (вядома з 1870; для змены аб'ёмнай Д. ўжываюцца рухомыя пляцоўкі-фуркі, паваротны круг і інш.); праекцыйная Д. заснавана на праекцыі на экран статычных і дынамічных выяў — арх. і пейзажных матываў, воблакаў, дажджу, снегу, полымя (вядома з 1908). Сярод прыёмаў афармлення з ужываннем розных сістэм Д.: сімультанны (адначасовы паказ розных месцаў дзеяння), «умоўны» (афармленне ў нейтральных сукнах ці шырмах або ў іх спалучэнні з арх. і бытавымі дэталямі на рухомай устаноўцы), прасторавы (сцэна з Д. акружае гледача з усіх бакоў). Кінадэкарацыі робяць трохмерныя з улікам умоў здымкі (план, ракурс, асвятленне), характару оптыкі і плёнкі. Ім дадаюць жывапісную і фактурную апрацоўку: умоўна-абагуленую для агульных і аддаленых планаў і ілюзорна-натуральную для буйных і спрадніх планаў. Д. ў кіно робіцца ў рэальную велічыню аб'екта або, як правіла, у выглядзе яго фрагмента (т. зв. «ігравой часткі»). Фрагмент Д. часам дапаўняецца макетамі і розным фонамі, якія ў кадры (з дапамогай перспект. сумяшчэння) злучаюцца з Д. ў адно цэлае. (Гл. таксама *Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва.*)


Літ.: Изенсон Н. Н. Техника сцены, М.— Л., 1940; Мюллер В. Н. Декорационное оформление спектакля, М., 1956; Толмачев В. Б. и Поляновский К. Н. Проектирование и постройка декораций, М., 1956; Кононлев В. Н. Производство кинофильмов, М., 1962; Мясников Г. А. Работа художника кино, М., 1965; Nicoll A. The development of the theatre, London, 1937.

Г. І. Барышаў. Мінск.









Уверсе: Сімультантная дэкарацыя да спектакля «Суддзя без розуму». Нясвіжскі т-р кн. Радзівілаў. 1748 (злева); эскіз кулісна-арачнай і ажурнай дэкарацыі С. П. Нікалаева да балета «Князь-возера» В. А. Залатарова. Бел. т-р оперы і балета. 1949. Уверсе: Эскіз павільённай дэкарацыі А. П. Марыкса да п'есы «Салавей» З. Бядулі. Бел. т-р імя Я. Купалы. 1937 (злева); эскіз праекцыйнай дэкарацыі Я. Г. Чамадурава да балета «Альпійская балада» Я. А. Глебава. Бел. т-р оперы і балета. 1967.

ДЭКАРТ (Descartes; латынізаванае Cartesius — Картэзій) Рэнэ (31.3.1596, мяст. Лаэ — 11.2.1650), французскі філосаф, матэматык, фізік, фізіёлаг. Прадстаўнік *дуалізму*. Філасофію падзяліў на дзве адносна самастойныя часткі: фізіку (вучэнне аб прыродзе) і метафізіку (вучэнне аб надпрыродным). У фізіцы развіваў пераважна матэрыялістычныя ідэі. Прыроду разглядаў як бесперапынную сукупнасць матэрыяльных часцінак. Рух разумеў механістычна, яго ўзнікненне тлумачыў вонкавым штуршком і зводзіў да простага перамяшчэння часцінак. Крытыкаваў сярэдневяковую схаластыку, не прызнаваў царк. аўтарытэту, лічыў неабходным на месца сляпой веры паставіць веды і ўсталяваць панаванне чалавека над сіламі прыроды. Браў пад сумненне ўсё, што рэальна існуе. Адзіна верагоднай ісцінай абвяшчаў пазнанне: «Я мыслю, значыць я існую». Выходзячы з гэтага ідэаліст. тэзіса, імкнуўся абгрунтаваць існаванне бога і рэальнасць навакольнага свету. У тэорыі пазнання Д.— пачынальнік *ра-*



цыяналізму. Аддаваў выключна вял. ролю ў пазнанні дэдукцыі, прызнаваў існаванне прыроджаных ідэй. У матэматыцы Д.— адзін са стваральнікаў аналітычнай геаметрыі, увёў паняцце пераменнай велічыні і функцыі, палепшыў сістэму алгебраічных абазначэнняў; у механіцы сцвярджаў адноснасць руху і спакою, упершыню сфармуляваў закон захавання колькасці руху; у касмогоніі выказаў ідэю натуральнага развіцця сонечнай сістэмы ў выніку віхрападобнага руху часцінак матэрыі; у фізіялогіі даў адно з першых навук. апісанняў рэфлекторнага акта. Матэрыяліст. і ідэаліст. элементы ў філасофіі Д. абумовілі яе ўплыў на далейшую гісторыю як матэрыяліст., так і ідэаліст. вучэнняў. На Беларусь прыродазнаўчанавуковыя і філас. ідэі Д. праніклі са значным спазненнем. Перамога феад.-каталіцкай рэакцыі ў 2-й пал. 17 — пач. 18 ст. стварыла несрыяльныя ўмовы для ўспрыняцця новай зах.-еўрап. філасофіі і прывяла да засілля сярэдневяковай схаластыкі. Е. Генгель, Ян Кавальскі, Е. Рудзкі і інш. схаласты, кнігі якіх выдаваліся і распаўсюджваліся на Беларусі і ў Літве, востра крытыкавалі з пазіцый тэалогіі фізіку і касмалогію Д. Сац.-эканам. ажыўленне ў сярэдзіне 18 ст. садзейнічала росту папулярнасці вучэння Д. Яго прыродазнаўчанавуковыя ідэі — прадмет дыспутаў у навуч. установах. Філосафы эклектычнага кірунку А. Скарульскі, С. Шадурскі і Б. Дабшэвіч імкнуліся аб'яднаць схаластыку з філасофіяй Д. У сваіх кнігах, выдадзеных у Навагрудку і Вільні, Шадурскі абвясціў Д. найвышэйшым навук. аўтарытэтам, падзяляў асн. прынцыпы яго філасофіі. Значны ўплыў вучэнне Д. зрабіла на фарміраванне светапогляду К. Нарбута. У канцы 18 ст. з пашырэннем асветніцкай ідэалогіі папулярнасць Д. на Беларусі знізілася. Асветнікі канца 18 — пачатку 19 стагоддзя І. Страйноўскі, Ян Снядэцкі і А. Доўгірд крытыкавалі суб'ектыўны ідэалізм Д. і яго тэорыю прыроджаных ідэй.

Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., М., 1950.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Святое семейство, Соч., т. 2, с. 139—141; Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Асмус В. Ф. Декарт, М., 1956; Быховский Б. Философия Декарта, М.— Л., 1940. *А. А. Бірала.* Мінск.

ДЭ КАСТЭР (De Coster) Шарль (20.8.1827, Мюнхен — 7.5.1879), бельгійскі пісьменнік, заснавальнік рэалістычнага кірунку ў л-ры Бельгіі. Пісаў на франц. мове. Скончыў Брусельскі ун-т (1855). Дэбютаваў каля 1847 як рамантык. У 1856—63 супрацоўнічаў у прагрэс. час. «Uylenspiegel» («Уленшпігель»). Першы значны твор — «Фламандскія легенды» (1858). Сведчанне схільнасці Дэ К. да рэалізму — «Брабанцкія апавяданні» (1861).



Сусв. вядомасць прынёс яму раман «Легенда пра Уленшпігеля і Ламе Гудзака, пра іх доблесныя, забаўныя і найслаўцейшыя справы ў Фландрыі і ў іншых краінах» (1867). Творча перапрацаваўшы стараж. флам. і ням. нар. кнігі пра Тыля Уленшпігеля (або Эйленшпігеля), пісьменнік перанёс героя — традыц. пацешніка і забаўніка — з 14 у 16 ст., у эпоху ўсенар. нац.-вызв. барацьбы, зрабіўшы яго барацьбітом-гёзам, які ўздымае сцяг паўстання супраць іспан. прыгнёту. Кніга Дэ К. сцвярджае ідэю бессмяротнасці народа, насычана духам свабодалюбства, нянавісцю да сац. несправядлівасці, да духавенства і багацеяў. Аўтар гістар. драмы «Стэфанія» (нап. 1853—55), псіхалагічнага рамана «Вясельнае падарожжа» (1870) і інш.

Тв.: Бел. пер.— Тыль Уленшпігель, Мн., 1940; рус. пер.— Легенда об Уленшпигеле и Ламме Гудзаке..., М., 1967.

Літ.: Мицкевич В. П. Шарль де Костер и становление реализма в бельгийской литературе, Мн., 1960; Шарль де Костер. Биобиблиогр. указатель, М., 1964. *В. П. Міцкевіч.* Мінск.

ДЭКАЦІРОЎКА (ад франц. decatir апошчаць бляск), апрацоўка параю ці гарачаю вадою шарсцяных і інш. тканін, каб пазбегнуць усадкі адзення з гэтых тканін. Заснавана на ўласцівасці валакна рабіцца пластычным ад цяпла і вільгаці.

Звычайна тканіну дэкаціруюць перад фарбаваннем; дэкаціруюць таксама апрацаваную тканіну, каб надаць ёй мяккасць ці пруткасць, бляск ці матавасць. Д. робіцца ў т. зв. дэкацірах і ўсадачных машынах; апошнія забяспечваюць бесперапыннасць працэсу Д. Гл. таксама *Аддзелка тканін*.

Літ.: Шмелев С. В. Технология и оборудование отделочного хлопчатобумажного производства, 2 изд., М., 1962; Садов Ф. И. и Корчагин М. В. Отделка тканей, М., 1958; Аничено Г. В. Текстильная промышленность Белоруссии, Мн., 1969.

ДЭКЛАМАЦЫЯ ў тэатры (лац. declamatio практыкаванне ў красамоўстве), мастацтва выразна чытаць вершы ці прозу.

Узнікла ў Ст. Рыме як частка красамоўніцкага мастацтва. Прынятая ў 17—18 ст. класіцызмам т-рам прыўзнятая, напеўная, умоўная Д. замяняецца ў канцы 18 — пач. 19 ст. жыццёва праўдзівай, індывідуалізаванай моваю, якую ўвёў рамант. і асабліва рэаліст. т-р. Тэрмін Д. ужываўся для вызначэння канцэртнага чытання вершаў з эстрады (назвай замяніўся тэрмінам *мастацкае чытанне*). Разнавіднасць эстраднай Д.— *меладэкламацыя*.

ДЭКЛАРАЦЫІ НАРОДНАГА СХОДУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ, канстытуцыйныя акты, прынятыя Народным (Нац.) сходам Зах. Беларусі 29—30.10.1939 у Беластоку. Прынята 4 Дэкларацыі. У іх выказана воля прац. пасельніцтва пра ўстанаўленне сацыяліст. ладу і ўз'яднанне з Беларускай ССР.

У Дэкларацыі аб дзярж. уладзе Беларусі Нар. (Нац.) сход прызнаваўся адзіным паўнапраўным носьбітам волі народаў Зах. Беларусі. Абвяшчалася, што ўся ўлада на тэрыторыі Зах. Беларусі належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных. У Дэкларацыі аб уз'яднанні Зах. Беларусі з БССР юрыдычна замацавана імкненне насельніцтва Зах. Беларусі ўз'яднацца ў адзінай сав. сацыяліст. дзяржаве. Гэтым ажыццяўлялася права народаў Зах. Беларусі на самавызначэнне. Дэкларацыя аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель ухваліла дзейнасць сялянскіх камітэтаў па перадачы памешчыцкіх зямель сялянам і адначасова абвясціла нацыяналізацыю ўсёй зямлі. Дэкларацыя аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці паклала пачатак перабудове ўсёй сістэмы нар. гаспадаркі (прамысловасці, транспарту, гандлю) зах. абласцей Беларусі і развіцці іх эканомікі на сацыяліст. аснове.

Нар. сход сваімі гіст. Дэкларацыямі ўстанавіў новы грамадскі і дзярж. лад. Яны сталі юрыд. асновай для прыняцця Вярх. Саветам СССР закону ад 2.11.1939 «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з уз'яднаннем яе з Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай» і закону Вярх. Савета БССР ад 14.11.1939 «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

Кр.: Народное (Национальное) собрание Западной Белоруссии (28—30 окт. 1939 г.). Стенографический отчет, Мн., 1946.

Літ.: Очерки истории государства и права БССР, в. 2, Мн., 1969; Гарбуноў Ц. Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве, Мн., 1949. *І. А. Юхо.* Мінск.

ДЭКЛАРАЦЫЯ (ад лац. declaratio заява, аб'ява), дакумент, у якім афіцыйна абвяшчаюцца аснoўныя ідэалагічныя і паліт. прынцыпы дзейнасці ўрада, партыі, грамадскіх арганізацый па найб. важных пытаннях (*Дэкларацыя аб утварэнні Саюза ССР, Дэкларацыя правоў народаў Расіі, Дэкларацыя 26 дзяржаў 1942* і інш.). У фін. праве Д.— заява падаткаплацельшчыка пра памеры яго маёмасці або даходу.

Кр.: Сборник законов СССР и Указов Президиума Верховного Совета СССР. 1938—1967, т. 1, М., 1968, с. 35—36, 40—41, 45—47, 62—63, 73—74, 397—398.

ДЭКЛАРАЦЫЯ 26 ДЗЯРЖАЎ 1942 (Вашынгтонская дэкларацыя 1942), падпісана 1.1.1942 у Вашынгтоне прадстаўнікамі Аўстраліі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Гаіці, Гандураса, Гватэмалы, Грэцыі, Дамініканскай Рэспублікі, ЗША, Індыі, Канады, Кітая, Коста-Рыкі, Кубы, Люксембурга, Нарвегіі, Нідэрландаў, Нікарагуа, Новай Зеландыі, Панамы, Паўднёва-Афрыканскага Саюза, Польшчы, Сальвадора, СССР, Чэхаславакіі і Югаславіі. Дзяржавы, якія падпісалі Дэкларацыю, абавязаліся выкарыстаць усе свае ваен. і эканам. рэсурсы ў вайне супраць фаш. Германіі, яе саюзнікаў і сатэлітаў, супрацоўнічаць між сабою, не заключаць сепаратнага перамір'я ці міру з ворагам. У Дэкларацыі гаварылася, што да яе могуць далучыцца інш. нацыі, якія памагаюць або могуць памагчы ў барацьбе з гітлерызмам. Дзяржавы, якія падпісалі Дэкларацыю і далучыліся да яе, атрымалі назву *Аб'яднаных Нацый*. Падпісанне Дэкларацыі было важным крокам у з'яднанні антыгітлераўскай кааліцыі.

Публ.: Внешняя политика Советского Союза в период Отечественной войны, т. 1, [М.], 1944.

ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ АБВЯШЧЭННІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, дзярж. і паліт. акт аб аднаўленні (другім абвяшчэнні) Беларускай ССР на асновах, вызначаных у *Маніфесце Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі* 1.1.1919. Прынята 31.7.1920 на сумесным пасяджэнні Мінскага губернскага ВРК і ЦК КП Літвы і Беларусі з прадстаўнікамі Бел. камуніст. арг-цыі, Бунда, бел. эсэраў і Цэнтр. бюро прафсаюзаў Мінскай губ. На той час уся тэр. Беларусі была вызвалена ад польскіх акупантаў. *Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка* ўжо не існавала. З бурж. Літвой 12.7.1920 быў заключаны мірны дагавор. Стала пытанне пра аднаўленне Беларускай ССР замест былой Літ.-Бел. ССР. Дэкларацыя не акрэслівала граніц Беларусі, а толькі сфармулявала прынцыпы, на аснове якіх павінна быць вызначана яе тэрыторыя. Паводле Дэкларацыі да склікання з'езду Саветаў БССР уся ўлада ў рэспубліцы перадавалася Ваенна-рэвалюц. к-ту БССР. Дэкларацыю падпісалі ад імя КП Літвы і Беларусі (падзел партыі адбыўся ў вер. 1920) В. Г. Кнорын, А. Р. Чарвякоў і І. Т. Смілга, ад імя прафсаюзаў А. М. Крыніцкі, ад імя Бел. камуніст. арг-цыі У. М. Ігнатоўскі, ад імя Бунда А. І. Вайнштэйн. Прадстаўнік бел. эсэраў падпісаць Дэкларацыю адмовіўся, хоць і згадзіўся супрацоўнічаць з сав. уладамі.

Кр.: Революционные комитеты БССР (июль — декабрь 1920 г.). Сб. документов и материалов, Мн., 1957, с. 12—13, 53—58.

Літ.: Каминский Н. И. и Карпачев А. М. К вопросу о провозглашении Белоруссии независимой советской социалистической республикой, «Исторический архив», 1957, № 3.

М. І. Каміскі. Мінск.

ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ УТВАРЭННІ СССР, гістарычны дакумент, якім абвешчана ўтварэнне СССР. Першапачаткова ў склад СССР увайшлі РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР. Праект дэкларацыі распрацаваны камісіяй, створанай 6.10.1922 Пленумам ЦК РКП(б); зацверджаны 29.12.1922 канфер. упаўнаважаных дэлегацый РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР. 30.12.1922 Дэкларацыя і *Дагавор аб утварэнні СССР* прыняты і зацверджаны *Першым з'ездам Саветаў СССР*, які ў сувязі з асаблівай важнасцю гэтых дакументаў перадаў іх на дадатковы разгляд ЦВК рэспублік. Спец. камісіі ЦВК у рэспубліках ухвалілі тэксты Дэкларацыі і Дагавору. Прапановы Камісіі Прэзідыума ЦВК БССР пад старшынствам А. Р. Чарвякова разгледжаны Прэзідыумам ЦВК БССР і ўхвалены 3-й сесіяй ЦВК Саветаў БССР 4-га скл. У Дэкларацыі называліся прычыны, якія абумовілі неабходнасць утварэння СССР: немагчымасць аднаўлення разбуранай вайной гаспадаркі пры раздзельным існаванні рэспублік, няўстойлівасць міжнар. становішча і небяспека новых нападаў з-за мяжы; выкладзены асновы і прынцыпы аб'яднання сав. рэспублік у адну саюзную дзяржаву — добраахвотнае аб'яднанне раўнапраўных народаў, забеспячэнне права за кожнай рэспублікай свабоднага выхаду з СССР, адкрыты доступ у СССР усім сав. сацыяліст. рэспублікам. Дэкларацыя ўключана як першы раздзел у Канстытуцыю СССР 1924.

Літ.: Ленін У. І. Да пытання аб нацыянальнасцях або аб «аўтанамізацыі», Тв., т. 36 (Поли. собр. соч., т. 45); История Советской Конституции (в документах). 1917—1956, М., 1957; Образование СССР. Сб. документов. 1917—1924, М.— Л., 1949; Маргунский С. П. Государственное строительство в БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921—1925), Мн., 1966.

ДЭКЛАРАЦЫЯ ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДУ САВЕТАЎ АБ АБ'ЯДНАННІ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ, гл. *Першы Усебеларускі з'езд Саветаў.*

ДЭКЛАРАЦЫЯ ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДУ САВЕТАЎ АБ УСТАНАЎЛЕННІ ФЕДЭРАТЫЎНАЙ СУВЯЗІ ПАМІЖ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАЙ І РСФСР, гл. *Першы Усебеларускі з'езд Саветаў.*

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ ПРАВО́Ў НАРО́ДАЎ РАСІІ, канстытуцыйны акт Сав. ўрада, якім абвешчаны і заканадаўча замацаваны асноўныя прынцыпы ленінскай нац. палітыкі. Праект Дэкларацыі распрацаваны У. І. Леніным і зацверджаны СНК 2(15).11.1917. Дэкларацыя абвяшчала: роўнасць і суверэннасць народаў; права народаў Расіі на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы; адмену ўсіх нац. і нац.-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў; свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і этнаграфічных груп.

Дэкларацыя мела вялікае значэнне ў перамозе сацыяліст. рэвалюцыі ў нац. раёнах, дала пачатак практычнаму ажыццяўленню праграмы Камуніст. партыі ў нац. пытанні. На яе аснове СНК 3(16).12.1917 прызнаў за ўкр. народам права на самавызначэнне і ўтварэнне Укр. рэспублікі; 18(31).12.1917 прызнаў незалежнасць Фінляндскай рэспублікі; 7(20).12.1918 прыняў дэкрэт аб незалежнасці Эстоніі; 22.12.1918 — дэкрэт аб незалежнасці Латвіі і Літвы; 31.1.1919 ВЦВК прыняў пастанову «Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі». Асн. палажэнні Дэкларацыі ўключаны ў Канстытуцыю СССР.

Публ.: Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства РСФСР, 1917, № 2, ст. 18; Образование СССР. Сб. документов. 1917—1924, М.—Л., 1949. *Я. Ф. Шорахай.* Мінск.

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ ПРАВО́Ў ПРАЦО́ЎНАГА І ЭКСПЛУАТУЕ́МАГА НАРО́ДА, канстытуцыйны акт Сав. Рэспублікі, што замацаваў заваёвы *Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі*, абвясціў асноўныя прынцыпы і задачы сацыяліст. дзяржавы. Праект Дэкларацыі напісаны У. І. Леніным, вынесены ім на разгляд ВЦВК і 3(16).1.1918 аднагалосна прыняты. Зацверджана 12(25) студз. 3-м Усерасійскім з'ездам Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і 18(31).1.1918 аб'яднаным 3-м Усерас. з'ездам Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Дэкларацыя вызначала паліт. асновы Сав. сацыяліст. дзяржавы як формы дыктатуры пралетарыяту; абвяшчала Расію Рэспублікай Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, якая ўтваралася на аснове свабоднага саюзу свабодных нацый як федэрацыя сав. нацыянальных рэспублік; вызначала асноўную задачу сацыяліст. дзяржавы — барацьбу за перамогу сацыялізма і адзначала першыя яе поспехі: адмену прыватнай уласнасці на зямлю, увядзенне рабочага кантролю, арганізацыю Вышэйшага савета нар. гасп., нацыяналізацыю банкаў. Уводзіла ўсеагульную прац. павіннасць, дэкрэтавала стварэнне Рабоча-Сялянскай Чырв. Арміі, раззбраенне маёмных класаў, пазбаўленне эксплуататараў выбарчых правоў. Пацвярджала асн. прынцыпы ўнутранай і знешняй палітыкі Сав. дзяржавы: знішчэнне эксплуатацыі чалавека чалавекам, задушэнне супраціўлення эксплуататараў, барацьба за мір, адмена тайных дагавораў, павага да нац. суверэнітэту ўсіх народаў; замацавала прынцыпы нац. палітыкі, выкладзеныя ў *Дэкларацыі правоў народаў Расіі*. Паводле прапановы У. І. Леніна ўключана ва ўступны раздзел Канстытуцыі РСФСР 1918.

Літ.: Ленін У. І. Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа, Тв., т. 26 (Полн. собр. соч., т. 35).

ДЭКЛАРА́ЦЫЯ ПРАВО́Ў ЧАЛАВЕ́КА І ГРАМАДЗЯНІ́НА, праграмны дакумент *Французскай буржуазнай рэвалюцыі канца 18 ст.*, які абвяшчаў асноўныя яе прынцыпы. Прынята Устаноўчым сходам 26.8.1789. Дэкларацыя абвяшчала прынцып нар. суверэнітэту, неад'емныя правы чалавека і грамадзяніна: юрыд. роўнасць, свабоду слова, сумлення і інш. бурж.-дэмакр. свабоды. Бурж. абмежаванасць дэкларацыі выявілася ў абвяшчэнні прыватнай уласнасці непарушным і свяшчэнным правам асобы. Дэкларацыя стала сцягам барацьбы супраць феад.-абсалютысцкіх парадкаў не толькі ў Францыі, але і для антыфеад. выступленняў у інш. краінах. Уключана ў франц. канстытуцыю 1791 як яе ўступная частка.

ДЭКРЭ́МЕНТ ЗАТУХА́ННЯ *л а г а р ы ф м і ч н ы*, натуральны лагарыфм адносін амплітуд ваганняў у моманты часу t і $t+T$. Выражаецца формулай $\nu = \ln \frac{A(t)}{A(t+T)} = \delta T$, дзе T — перыяд ваганняў, δ — каэфіцыент затухання. Д. з. — велічыня, адваротная ліку ваганняў N, на працягу якіх амплітуда памяншаецца ў e разоў. Час, за які адбываюцца гэтыя N ваганняў, наз. часам рэлаксацыі.

ДЭКРЭ́Т (лац. decretum пастанова), заканадаўчы акт вышэйшага органа дзярж. улады або дзярж. кіравання.

У першыя гады Сав. улады Д.— законы і пастановы з'ездаў Саветаў, СНК, ВЦВК па найважнейшых пытаннях жыцця краіны (*Дэкрэт аб міры, Дэкрэт аб зямлі*, аб 8-гадзінным рабочым дні і інш.). Паводле Канстытуцыі СССР 1924 Д.— акты заканадаўчага характару, якія выдаваліся ЦВК, яго Прэзідыумам і СНК СССР. У Канстытуцыі СССР 1936 тэрмін Д. не ўжываецца. У некат. сацыяліст. краінах Д.— акты вышэйшага органа дзярж. улады (напр., у Польшчы акты Дзярж. Савета). У бурж. краінах (Францыя і інш.) Д.— акт, які выдаецца кіраўніком дзяржавы.

Літ.: Декреты Советской власти, т. 1—5, М., 1957—71.

ДЭКРЭ́Т «АБ АБ'ЯДНА́ННІ САВЕ́ЦКІХ РЭСПУБЛІ́К: РАСІІ, УКРАІ́НЫ, ЛАТВІІ, ЛІТВЫ, БЕЛАРУСІ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З СУСВЕ́ТНЫМ ІМПЕРЫЯЛІ́ЗМАМ», прыняты па ініцыятыве ЦК РКП(б) і прапановах ЦВК Украіны, Савета абароны Літвы і Беларусі, урада Сав. Латвіі 1.6.1919 на пасяджэнні ВЦВК з удзелам прадстаўнікоў Украіны, Беларусі, Латвіі і Літвы. Прызнаў за неабходнае шляхам пагаднення з ЦВК і СНК сав. рэспублік правесці аб'яднанне ваен. арг-цыі і ваен. камандавання, саветаў нар. гаспадаркі, чыг. ўпраўлення і гаспадаркі, фінансаў, камісарыятаў працы, каб сканцэнтраваць кіраўніцтва гэтымі галінамі ў адзіных калегіях. Аформіў ваен.-паліт. саюз рэспублік, які склаўся ў гады грамада. вайны і адыграў вял. ролю ў перамозе над інтэрвенцыяй і ўнутр. контрэвалюцыяй, быў важным этапам на шляху стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Публ.: Собрание узаконений и распоряжений рабоче-крестьянского правительства РСФСР, 1919, № 21, ст. 264; Образование СССР. Сб. документов. 1917—1924, М.—Л., 1949.

Літ.: История СССР с древнейших времен до наших дней, т. 7, М., 1967, с. 522—523. *Я. Ф. Шорахай.* Мінск.

ДЭКРЭ́Т АБ ЗЯМЛІ, першы савецкі закон аб зямлі, прыняты *Другім Усерасійскім з'ездам Саветаў* у ноч з 26 на 27.10(8—9.11).1917. Праект Дэкрэта напісаны У. І. Леніным. Пры выпрацоўцы Дэкрэта выкарыстаны агульнасялянскі наказ аб зямлі, складзены на падставе 242 мясцовых сялянскіх наказаў, якія адпавядалі патрабаванням шырокіх мас прац. сялян. Паводле Дэкрэта ўсе землі непрацоўнага карыстання — памешчыцкія, удзельныя, манастырскія, царкоўныя — канфіскоўваліся без выкупу і разам з гасп. пабудовамі і ўсім інвентаром перадаваліся ў распараджэнне валасных земельных к-таў і павятовых Саветаў сялянскіх дэпутатаў. Адмянялася прыватная ўласнасць на зямлю, забараняліся яе продаж, арэнда і залог, зямля станавілася дзярж. уласнасцю. Гэта азначала нацыяналізацыю зямлі, ажыццяўленне галоўнага патрабавання *аграрнай праграмы КПСС*. Права карыстацца зямлёю атрымалі ўсе грамадзяне пры ўмове апрацоўкі яе ўласнай працай, на падставе ўраўняльнага землекарыстання і свабоднага выбару формаў землекарыстання.

Паводле Д. аб з. сяляне Расіі атрымалі больш за 150 млн. дзесяцін зямлі і былі вызвалены ад арэндных плацяжоў памешчыкам на суму 700 млн. руб. золатам. Агр. пераўтварэнні на Беларусі паводле Д. аб з. пачаліся ўвосень 1917 і закончыліся пасля таго, як былі выгнаны нямецкія і польскія акупанты ў 1918—20. У выніку ажыццяўлення ленінскага Д. аб з. сяляне ўсх. абласцей Беларусі атрымалі 1645,8 тыс. дзесяцін зямлі, іх землекарыстанне павялічылася на 32,7%. Іл. гл. ў арт. *Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.*

Літ.: Ленін У. І. Даклад аб зямлі 26 кастрычніка (8 лістапада) [Другі Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў 25—26 кастр. (7—8 ліст.) 1917 г.], Тв., т. 26 (Полн. собр. соч., т. 35); Ленинский декрет «О земле» и современность, М., 1970; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967. *І. І. Саладкоў.* Мінск.

ДЭКРЭ́Т АБ МІ́РЫ, адзін з першых дэкрэтаў Савецкай улады; напісаны У. І. Леніным і прыняты *Другім Усерасійскім з'ездам Саветаў* 26.10(8.11).1917. Змяшчаў адозву сав. ўрада да народаў і ўрадаў усіх дзяржаў — удзельніц вайны пачаць перагаворы пра спыненне вайны і заключэнне справядлівага дэмакр. міру без анексій і кантрыбуцый. Д. аб м.— найважнейшы праграмны дакумент знешняй палітыкі Сав. улады, які даў пачатак генеральнай лініі знешняй палітыкі Сав. краіны, разлічанай на мірнае суіснаванне з капіталіст. дзяржавамі. Дэкрэтам упершыню ў гісторыі абвешчаны новыя прынцыпы міжнар. палітыкі: мір і мірнае суіснаванне, пралетарскі інтэрнацыяналізм, прызнанне поўнага раўнапраўя ўсіх народаў, павага да іх нац. і дзярж. незалежнасці, неўмяшанне ва ўнутраныя справы інш. краін, прызнанне законнасці і справядлівасці вызв. барацьбы прыгнечаных народаў; асуджана ганебная калан. сістэма.

Д. аб м. быў шырока распаўсюджаны на франтах 1-й сусв. вайны, яго падтрымалі салдаты і рабочыя Англіі, Францыі, ЗША, Германіі і інш. краін. На падставе Д. аб м. і ў сувязі з тым, што імперыял. ўрады ЗША, Англіі і Францыі адмовіліся ад перагавораў аб міры, сав. ўрад вырашыў пачаць мірныя перагаворы з аўстра-герм. кааліцыяй. 21.11(4.12).1917 быў заключаны *Дагавор аб перамір'і на Заходнім фронце*, 2(15).12.1917 дагавор аб перамір'і на ўсіх франтах паміж Савецкай Расіяй і краінамі германскага блоку тэрмінам на 28 дзён, *Брэсцкі мір 1918*. Іл. гл. ў арт. *Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.*

Літ.: Ленін У. І. Даклад аб міры 26 кастрычніка (8 лістапада).— Заключнае слова па дакладу аб міры 26 кастрычніка (8 лістапада) [Другі Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў 25—26 кастр. (7—8 ліст.) 1917 г.], Тв., т. 26 (Полн. собр. соч., т. 35).

І. І. Саладкоў. Мінск.

ДЭКСАМЕТАЗО́Н, сінтэтычны аналаг *картызону*, у 35 разоў актыўнейшы за яго.

ДЭЛАВЭ́Р (Delaware), штат на У ЗША, на ўзбярэжжы аднайменнага заліва Атлантычнага ак. Пл. 5,3 тыс. км². Нас. 543 тыс. чал. (1970). Адм. ц. Довер. Паверхня раўнінная, на У забалочаная. Клімат умераны, вільготны. Лясы высечаны. Хім., гумавая, металаапр., машына- і суднабуд., тэкстыльная, гарбарная прамысл. С. гасп. прыгараднага тыпу. Агародніцтва, садоўніцтва. Пасевы кукурузы і пшаніцы. Гадуюць птушак, буйн. раг. жывёлу, свіней. Транспарт пераважна аўтамабільны і чыгуначны.


ДЭЛАКРУА́ (Delacroix) Эжэн (26.4.1798, Шарантон-Сен-Марыс — 13.8.1863), французскі жывапісец, найбольш значны прадстаўнік рамант. кірунку. Вучыўся ў П. Герэна. Уже ранніе работы Д. («Дантэ і Вергілій», 1822) сведчылі пра імкненне да геараічнага, эмацыянальнага мастацтва. Аўтар поўных напружанага драматызму карцін, прысвечаных падзеям у Грэцыі, якая змагалася за незалежнасць («Разня на Хіосе», 1823—24; «Грэцыя на руінах Місалунгі», 1826), рэвалюц. руху франц. народа («Свабода, якая вядзе народ», 1830). Вялікае месца ў творчасці Д. займае гістар. і батальны жанр («Бітва пры Тайбуры», 1837). Пасля падарожжа ў Алжыр і Марока стварыў карціны на ўсх. сюжэты («Алжырскія жанчыны», 1834; «Паляванне на львоў у Марока», 1854). Аўтар партрэтаў (аўтапартрэты, партрэт Ф. Шапэна, 1838), пейзажаў і нацюрмортаў; працаваў у галіне дэкар. роспісаў і графікі (іл. да твораў У. Шэкспіра і І. В. Гётэ). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Гістарычны жанр.*



Тв.: Рус. пер.— Дневник Делакруа, т. 1—2, М., 1961.

Літ.: Ситник К. Эжен Делакруа. 1798—1863, М.— Л., 1947; Эжен Делакруа. Альбом, М., 1961.

ДЭЛІ, сталіца Індыі і адм. ц. штата Дэлі. На правым беразе р. Джамны (прыток Ганга). Вузел чыгунак і шашэйных дарог, два аэрапорты (у т. л. міжнародны). 3621 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1969). Тэкст., харч. (у т. л. млыны, маслабойні), швейная, дрэваапр., палігр., хім.-фармацэўтычная (у т. л. вытворчасць ядахімікатаў) прамысловасць, рамонтна-мех. майстэрні. Мастацкія промыслы (ювелірныя, медныя, бронзавыя; керамічныя вырабы, разьба па косці, вышыўка, ціснение



Дэлі. Плошча фантанаў.

на скуры, ручное ткацтва і інш.). Вял. банкі. Ун-т (з 1922), Акадэмія мастацтваў, Акадэмія танца, драмы і музыкі, Нац. акадэмія н-рыі. Нац. музей Індыі, Нац. галерэя сучаснага мастацтва.

Засн. прыблізна ў 11 ст. на месцы старажытнага горада Індрапрастха. З 1206 сталіца Дэлійскага султаната, з 1526 імперыі *Вялікіх Маголаў*. У 1803 захоплены англічанамі. Адзін з цэнтраў *Індыйскага нацыянальна-вызвольнага паўстання 1857—59*. У 1911 з Калькуты ў Д. перанесена сталіца Брыт. Індыі. З 1947 сталіца дамініёна, з 1950 сталіца Рэспублікі Індыі. На тэр. Д. захаваліся рэшткі старажытных гарадоў-крэпасцей. У Старым горадзе зберагліся арх. помнікі імперыі Маголаў 17 ст.: палацы ў крэпасці Лал-Кіла (1639—48), саборная мячэць (1644—58), за 20 км на ПД — горад-крэпасць Лал-Кот, дзе захаваліся жалезная калона (415), мінарэт Кутб-Мінар (пасля 1200), маўзалей Ільтутмыша (пасля 1235) і інш. На ПЗ ад Старога горада — каменная калона Ашокі (3 ст. да н. э.). Новы Д. забудоўваўся ў 1913—29 паводле праекта англ. арх. Э. Лаціэнса і Х. Бейкера. Круглы будынак парламента і інш. Урадавыя пабудовы складаюць ефектны ансамбль. Горад багата азеляніны. У 50—60-я г. з'явіліся жылыя раёны з шматпавярховымі дамамі.

ДЭЛІРЫЙ (лац. delirium вар'яцтва), трызненне, расстройства прытомнасці з галюцынацыямі пры інфекцыйных хваробах, атручэннях, алкагалізме, запаленнях мозгу і інш. Гл. таксама *Прытомнасці парушэнні*.

ДЭЛЬТА, своеасаблівая форма вусця ракі, што ўтвараецца на мелкаводных участках мора ці возера пры ўпадзенні ў іх рэк з вялікай колькасцю наносаў. Назва паходзіць ад Д. Ніла, падобнай на грэч. літару Δ (дэльта).

Асаджэнасцца матэрыял з-за рэзкага памяншэння скорасці цячэння ракі і каагуляцыі дробных часцінак у рачной вадзе пры сустрэчы яе з салёнымі марскімі водамі. Найб. грубазярністы матэрыял збіраецца на паверхневых дэльтавых раўнінах; добра адсартаваны тонказярністы складае донную частку Д. Памеры і будова Д. залежаць ад воднасці і скорасці цячэння ракі, саставу і колькасці ва ёй абломкавага матэрыялу, ад тэктанічнага рэжыму акваторыі і гідралагічнага рэжыму прылеглай часткі вадасму. Д. часта займаюць вял. плошчы (Волгі каля 19 тыс. км², Лены 45 тыс. км², Хуанхэ 500 тыс. км²). Многія з іх хутка растуць (напр., прырост Д. Сырдар'і да 110 м у год). Магутнасць адкладаў у Д. да некалькіх сотняў метраў.


Літ.: Ваялогин Б. С. и Родионов Н. А. Устьевые области рек СССР. М., 1969; Аполлов В. А. Учение о реках. М., 1963.

ДЭЛЬТА-ФУНКЦЫЯ (δ-функцыя, функцыя Дзірака), $\delta(x)$, сімвал, што ўжываецца ў матэматычнай фізіцы пры рашэнні задач, у якіх ўваходзяць сканцэнтраваныя велічыні (нагрузка, зарад, маса і інш.). Д.-ф. можна вызначыць як шчыльнасць размеркавання мас, калі ў пункце $x=0$ сканцэнтравана адзінкавая маса, а ва ўсіх астатніх пунктах маса роўная нулю. Таму лічаць, што $\delta(x)=0$ пры $x\neq 0$ і $\delta(x)=\infty$ пры $x=0$, прычым $\int_{-\infty}^{\infty}\delta(x)\,dx=1$. Асноўная ўласцівасць Д.-ф., якая вынікае з гэтага вызначэння: $\int_{-\infty}^{\infty}f(x)\delta(x)dx=f(0)$. Д.-ф. не можа ўваходзіць ні ў якія канчатковыя выразы. Калі вінуць Д.-ф., то заўсёды маюць на ўвазе ў далейшым інтэграванне па тых пераменных, ад якіх яна залежыць. Д.-ф. можна разглядаць як границу паслядоўнасці *аналітычных функцый*.

ДЭЛЬФІН (у спорце), адзін з відаў плавання стылем батэрфляй. Гл. *Плаванне*.

ДЭЛЬФІНАВЫЯ, дэльфіны (Delphinidae), сямейства млекакормячых надатр. зубатых кітоў. Вядома каля 70 відаў (20 родаў), аб'яднаных у 2 падсям.: дэльфінавых (18 родаў) і бялухавых (2 роды). Пашыраны Д. ва ўсіх морах (акрамя Каспійскага і Аральскага). У водах СССР найб. вядомыя марская свіння, касатка, афаліна, звычайны дэльфін (белабочка), бялуха.


Даўж. жывёл ад 1,5 (звычайны дэльфін) да 10 м (касатка). Прадаўгаватае цела канчаецца гарызантальна размешчаным хваставым плаўніком, пярэднія канечнасці ператвораны ў плаўнікі. Скура голая, розная колеру. У бялухавых круглая галава, да 40 зубоў, плаўнікоў няма; дэльфінавым маюць добра развіты спінны плаўнік, больш як 70 зубоў, доўгую галаву, якая ўтварае «дзюбу». Адносная маса мозгу Д. набліжаецца да масы мозгу чалавека (у афаліны мозг дасягае 2 кг, што 1% агульнай масы цела). Корміцца Д. рыбай, галаваногімі малюскамі, ракападобнымі і інш. Некат. віды прамысловыя. Прамысел Д. Азова-Чарнаморскага басейна (Д. звычайнага — Delphinus delphis, афаліны — Tursiops truncatus, марской свіні — Phocaena phocaena) забаронены з 1.5.1966 тэрмінам на 10 гадоў. Д. сталі аб'ектам спец. даследавання, асабліва ў сувязі з развіццём біянікі. Вучоных цікавіць анатама-фізіял. механізмы і гідрадынамічныя прыстасаванні жывёл, якія забяспечваюць ім вял. скорасць руху; будова і функцыі слыхавога і эрасавага аналізатараў, механізм падачы і ўспрымання гукавых імпульсаў і інш. У многіх краінах будуюцца акеанарыумы, у СССР — на ўзб. ўзбярэжжы Крыма (Карадаг) і ў раёне Батумі.



1. Дэльфін-белабочка. 2. Афаліна.

Літ.: Млекопитающие фауны СССР, ч. 2. М.—Л., 1963; Томилин А. Г. Китообразные фауны морей СССР. М., 1962; Бобринский Н. А., Кузнецов Б. А. и Кузякин А. П. Определитель млекопитающих СССР, 2 изд., М., 1965 (бібліягр.); Линдли Дж. Человек и дельфин. Пер. с англ. М., Изд-во иностр. лит., 1963; Марковский Ю. М. Дельфины Белого моря. Л., Изд-во Ленингр. ун-та, 1965.

ДЭЛЮВІЙ (ад лац. deluo змываю), прадукты выветрывання горных парод, перанесеныя ўніз па схіле ад карэнных выхадаў у выніку змывання дажджавымі і расталымі водамі, анаўвання над уплывам сілы цяжару і цякучасці грунту. Звычайна Д.— неадсартаваная мех. сумесь несартаваных вуглаватых абломкаў і супясчана-суглінкавага матэрыялу, які ўтварае шлейф каля падножжа схілаў. Магутнасць да некалькіх дзесяткаў метраў.

















Дэкаратыўныя расліны 1.

1. Рабатка з гваздзіка турэцкага. 2. Гладыёлус гібрыдны. 3. Бэз махрысты. 4. Складаная рабатка з сібірскіх касачоў і ўсходніх макаў. 5. Гваздзік Грэнадзін. 6. Флёкс мяцёлчаты. 7. Рамонак садовы. 8. Ружа чайна-гібрыдная.



1



2

Дэкаратыўныя расліны II.

1. Клумба з цюльпанаў.
2. Рабаткі з сальвій і паліянтавых ружаў.
3. Рабатка з эшольцый.
4. Лілея кучаравістая.
5. Кала з стацыяй.
6. Гербера.
7. Вяргіня дэкаратыўная.
8. Цынія зграбная.



3



4



5



6



7



8

раў. У Д. частыя россыпы золата, волава, вальфраму і інш. металаў.

ДЭМАГРАФІЧНАЯ СТАТЫСТЫКА, галіна статыстыкі, якая распрацоўвае метадалогію і методыку разлікаў дэмаграфічных паказчыкаў. Дэмаграфічныя звесткі пра насельніцтва неабходны для планавання эканам., сац. і культ. развіцця краіны. Крыніцы звестак — перапісы, рэгістрацыя нараджэнняў, смерці, шлюбаў, разводаў, міграцыі (прыбыцці і выбыцці) насельніцтва і інш.

У дарэвалюцыйнай Расіі сістэматычны збор звестак пра колькасць, склад, рух насельніцтва (праваслаўнага) пачаўся ў 20-я г. 18 ст. з увядзеннем *рэвізій*. У час правядзення 5-й рэвізіі (1795) упершыню быў вроблены перапіс бел. насельніцтва. Улічваўся сац. склад насельніцтва для вызначэння падушнага абкладання. Першы ўсеагульны перапіс у дарэвалюц. Расіі (у т. л. на тэрыторыі 5 бел. губерняў) быў праведзены ў 1897. Улічвалася колькасць насельніцтва па гарадах і паветах, размеркаванне яго па гаспадарках, па саслоўях, паводле полу, узросту, адукацыі, веравызнання, сямейнага становішча, роду заняткаў і г. д. Паводле гатага перапісу Беларусаў у 1897 было 5 885 547 чал. У СССР пасля Кастр. рэв. было 5 перапісаў. Паміж перапісамі на падставе звестак пра натуральны (колькасць народжаных мінус колькасць памерлых) і механічны (колькасць тых, што прыбылі, мінус колькасць тых, што выбылі) прыросты насельніцтва праводзіцца ацэнка яго колькасці і складу на пачатак года, а таксама ў перспектыве на 5—10 гадоў. Асн. паказчыкі Д. с.: колькасць (на дату і сярэднегадавая) насельніцтва і яго склад, шчыльнасць, каэфіцыенты нараджальнасці і смяротнасці (агульнай і дзіцячай), натуральнага прыросту, шлюбаў і разводаў, сярэдняй працягласці жыцця і г. д. У Д. с. адрозніваюць катэгорыі насельніцтва: наяўнае, якое ў момант перапісу жыве ў пэўным нас. пункце, і пастаяннае, якое пастаянна жыве ў гэтым пункце.

Паводле перапісу 1970 на Беларусі 9002 тыс. чал. За 11 гадоў, пасля перапісу 1959, яно павялічылася на 947 тыс., або на 12%. Удзельная вага гар. насельніцтва выраслa на 13% і складае 43% (у павелічэнні яго 62% займае механічны прырост і адм. пераўтварэнні, 38% — натуральны). Колькасць жанчын перавышае колькасць мужчын, асабліва ў старым узросце, што выклікана пераважна Айч. вайною. Нараджаецца на Беларусі, як і ва ўсім свеце, больш хлопчыкаў, чым дзяўчынак (адпаведна 106 і 100). Сярэдняя працягласць жыцця чалавека ў БССР 73 гады. Смяротнасць насельніцтва паменшала ў 1969 у параўн. з 1913 у 3,4 раза. Насельніцтва СССР на 15.1.1970 — 241,7 млн. чал., усяго свету 3 млрд. 600 млн. чал. (ацэнка на пач. 1970). Гл. таксама *Дэмаграфія*.

Кр.: Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г., под ред. Н. А. Тройницкого, [т.] 4 (тетради 1—3) — Виленская губ.; [т.] 5 (тетради 1—3) — Витебская губ.; [т.] 11 — Гродненская губ.; [т.] 22 — Минская губ.; [т.] 23 — Могилевская губ., СПб., 1899—1904.

Літ.: Марков А. М. Демографическая статистика, 2 изд., М., 1965; Вопросы демографии. Сб. ст., М., 1970; Народонаселение и экономика, М., 1967; Кабузан В. М. Народонаселение России в XVIII — первой половине XIX в., М., 1963; Гохман А. И. Переписи населения земного шара, М., 1970; Пресса Р. Народонаселение и его изучение, пер. с франц., М., 1966.

А. М. Мацвеева. Мінск.

ДЭМАГРАФІЯ (грэч. dēmos народ + *...графія*), навука пра народанасельніцтва, яго развіццё і ўзнаўленне. Сацыяліст. Д. вывучае народанасельніцтва як сукупнасць людзей, якія ўступаюць у вытв. адносіны, а таксама дэмаграфічныя працэсы ў гэтых сукупнасцях, развіццё *народанасельніцтва* з пункту погляду яго дэмаграфічнага ўзнаўлення. Базіруецца на марксісцка-ленінскай паліт. эканоміі, гістар. матэрыялізме і марксісцкай сацыялогіі.

Асн. кірункі і раздзелы Д.: сфера руху і развіцця насельніцтва (нараджальнасць, смяротнасць, прырост, міграцыйныя працэсы; прагноз яго колькасці, складу, размеркавання, шлюбнасць, сям'я як нач. вялікі дэмаграфічнага ўзнаўлення, дзярж. і грамадскія меры ўплыву на дэмаграфічныя працэсы); насельніцтва і эканам. развіццё (суадносіны эканам. і дэмаграфічнага росту, праблемы і крытэрыі занятасці, дэмаграфічныя праблемы выкарыстання прац. рэсурсаў, іх прафесійны і кваліфікацыйны склад, эканам. ўмовы развіцця і ўзнаўлення насельніцтва); насельніцтва і прыродныя рэсурсы і г. д. Вывучэнне дэмаграфічных з'яў у іх узаемнай сувязі і абумоўленасці, іх змены і развіццё сярод насельніцтва пэўнай тэрыторыі наз. дэмаграфічным даследаваннем або дэмаграфічным аналізам. Аналіз дзеліцца на колькасны (дае колькасную характарыстыку насельніцтва) і якасны (вывучае якасныя прыкметы і характарыстыкі народанасельніцтва, уключаючы яго генетыку). Дэмаграфічныя працэсы і з'явы разглядаюцца з пункту погляду класавага складу насельніцтва, сутнасці і ролі класаў і сац. груп у грамадстве. Як навука Д. мае пэўныя раздзелы. Дэскрыптыўная Д. мае дэталёвую схему паказчыкаў, якія характарызуюць насельніцтва і пабудаваны на аснове стат. звестак пра народанасельніцтва. Тэарэтычная Д. вызначае колькасныя адносіны дэмаграфічных працэсаў незалежна ад інш. з'яў. Эканам. і сац. Д. вывучаюць сувязі паміж дэмаграфічнымі, эканам. і сац. з'явамі. Гістарычная Д. высвятляе гісторыю развіцця народанасельніцтва. Матэм. Д. — раздзел тэарэтычнай Д. — вывучае прымяненне матэм. метадаў да вывучэння праблем народанасельніцтва. Патэнцыяльная Д. даследуе жыццёвы патэнцыял насельніцтва — агульную колькасць чалавека-гадоў, якія належыць пражыць людзям пэўнай сукупнасці. Ваенная Д. вывучае ваенны дэмаграфічны патэнцыял краіны ў сувязі з эканам. і тэхн. патэнцыялам, выкарыстанне яго ў мірны і ваенны час, вынікі войнаў і г. д. Прадмет геадэмаграфіі, або геаграфіі насельніцтва, — тэрытарыяльныя аспекты развіцця народанасельніцтва, яго ўзнаўлення і рассялення. Мед. Д. вывучае дэмаграфічныя аспекты здароўя і ўзнаўлення насельніцтва. Метадалогію і методыку разлікаў дэмаграфічных паказчыкаў дае *дэмаграфічная статыстыка*. Д. цесна сутыкаецца з этнаграфіяй, экалогіяй, біяметрыяй і інш. навукамі.

Пэўная трактоўка ўзаемадзеяння эканам., бія-сац., дэмаграф. і інш. працэсаў складае сутнасць тэорыі або канцэпцыі народанасельніцтва. Дэмаграфічныя канцэпцыі адлюстроўваюць інтарэсы пэўных грамадскіх класаў і партый. Бурж. дэмаграфічныя канцэпцыі апалагетычна растлумачваюць рэчаіснасць у інтарэсах эксплуататарскіх класаў. Сукупнасць мерапрыемстваў, якімі дзейнічаюць на дэмаграфічныя працэсы, стварае палітыку народанасельніцтва, або дэмаграфічную палітыку, — частку агульнай сац.-эканам. палітыкі. Бурж. палітыка ў галіне народанасельніцтва з'яўляецца рэалізацыяй інтарэсаў і поглядаў пануючых класаў на дэмаграфічныя працэсы. Яе мэта — ахова непарушнасці капіталіст. ладу. Мэта дэмаграфічнай палітыкі сацыяліст. краін абумоўлена асн. эканам. законам сацыялізма, які забяспечвае гарманічнае і аптымальнае сац.-эканам. і дэмаграфічнае развіццё грамадства.

Літ.: Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952; Валентей Д. И. Теория и политика народонаселения, М., 1967; Коросте-

лев Г. М. Рост народонаселения и общественный прогресс, Свердловск, 1968; Урланис Б. Ц. Рождаемость и продолжительность жизни в СССР, М., 1963; Писарев И. Ю. Население и труд в СССР, М., 1966; Слесарев Г. А. Методология социологического исследования проблем народонаселения СССР, М., 1965; Раков А. А. Население БССР, Мн., 1969; Юркевич Н. Семья в современном обществе, Мн., 1964; Народонаселение и экономика, М., 1967; Корчак-Чепурковский Ю. А. Избранные демографические исследования, М., 1970; Курс демографии, под ред. А. Я. Боярского, М., 1967; Рождаемость и ее факторы, М., 1968; Методы демографических исследований, М., 1969; Население и экономика, М., 1970; Теоретические проблемы демографии, М., 1970; Россет Э. Процесс старения населения, пер. с польск., М., 1968; Щепаньский Я. Элементарные понятия социологии, пер. с польск., М., 1969. *А. А. Ракаў.* Мінск.

ДЭМАКРАТЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА, тайная рэвалюц. арганізацыя, якая дзейнічала ў 1836—38 у Віленскай мед. акадэміі. Заснавальнік і арганізатар Ф. А. *Савіч.* Складалася са студэнтаў, выхадцаў з разначынпага асяроддзя і дробнай шляхты. Уваходзілі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей: беларусы, рускія, украінцы, палякі і інш.

Т-ва мела статут «Прынцыпы дэмакратызму», у якім вызначаліся яго мэты (дапамога ўсім людзям незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання або становішча), прынцыпы маральнага самаўдасканалення, галоўным з якіх лічылася праца. Пад уплывам Савіча т-ва ўсё больш выразна набывала сац. кірунак. Гэтаму садзейнічала і ўстанаўленне ў 1837 сувязей з Ш. *Канарскім,* які ўзначальваў тайную арг-цыю «Садружнасць польскага народа», што дзейнічала на тэр. Беларусі, Літвы і Украіны (1835—38). Д. т. пад назвай «Маладая Польшча» ўвайшло ў склад «Садружнасці» як яе радыкальнае крыло. У той перыяд члены т-ва імкнуліся наладзіць сувязі з сялянамі і рамеснікамі, прапагандавалі сярод іх ідэі свабоды і роўнасці, каб духоўна падрыхтаваць іх да адкрытай барацьбы супраць сац. і нац. прыгнёту. Погляды членаў Д. т. фарміраваліся пад уплывам нац.-вызв. руху ў Польшчы, барацьбы сялян супраць прыгону, а таксама твораў дэмакр. і гуманіст. л-ры і філасофіі-асветнікаў. Спасылаючыся на натуральнае права роўнасці ўсіх людзей, члены т-ва абгрунтоўвалі неабходнасць барацьбы супраць ладу, які абараняе няроўнасць і эксплуатацыю, выступалі за права кожнага народа на нац. самастойнасць. Паслядоўна адстойвалі ідэю рэвалюц. саюзу брацкіх народаў у барацьбе супраць самадзяржаўя, лічылі сябе прадаўжальнікамі справы дзекабрыстаў. Найлепшай формай дзярж. кіравання абвяшчалі рэспубліку. Выступалі за асвету народа і абуджэнне яго чалавечай годнасці. Ідэалогія Д. т. адлюстравала працэс пераходу ад шляхецкай рэвалюцыйнасці да рэвалюц. дэмакратызму.

У чэрв. 1838 частка членаў Д. т. арыштавана. Савіч і яго памочнікі Ян Загорскі і Казімір Рабчынскі прыгаворапы да ссылкі на Каўказ, астатнія аддадзены ў салдаты. Тыя, хто пазбег арышту, не пакінулі рэвалюц. дзейнасці. У 1840—41 некаторыя былі прыцягнуты да следства па новай суд. справе пра антыўрадавыя настроі. Д. т. адыграла важную ролю ў гісторыі вызв. барацьбы на Беларусі і ў развіцці прагрэс. грамадскай думкі ў 30-я г. 19 ст.

Літ.: Мохнач Н. Н. Идейная борьба в Белоруссии в 30—40-е гг. XIX в., Мн., 1971, с. 9—51; Смірноў А. П. Франц Савіч, Мн., 1961; Ягож. Революционные связи народов России и Польши, 30—60 гг. XIX, М., 1962; Мошковский К. Рукопись в тюрьме. Очерк духа Виленской Академии от учреждения оной до 1839 года, «Русский архив», 1909, № 4, с. 534—564. *Н. М. Махнач.* Мінск.

ДЭМАКРАТЫЧНЫ ЦЭНТРАЛІЗМ, асноўны арганізацыйны прынцып будовы і дзейнасці марксісцка-ленінскіх партый, органаў дзярж. ўлады, гасп. кіравання, грамадскіх арг-цый у СССР і сацыяліст. краінах. Д. ц. у КПСС замацаваны ў Статуце КПСС і азначае: выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі знізу даверху; развіццё *дэмакратыі ўнутрыпартыйнай;* перыяд. справаздачнасць парт. органаў перад сваімі парт. арг-цыямі; строгую *дысцыпліну партыйную* і падпарадкаванне меншасці большасці; безумоўную абавязковасць рашэнняў вышэйшых органаў для ніжэйшых. Д. ц. у сав. дзярж. апараце азначае: выбарнасць народам усіх органаў улады ў цэнтры і на месцах; справаздачнасць дэпутатаў перад выбаршчыкамі, выбаршчыкам даецца права адклікаць дэпутатаў; кіруючыя органы дзярж. кіравання фарміруюцца прадстаўнічымі органамі (у цэнтры: Саветы Міністраў — Вярх. Саветамі; на месцах: выканкомы — мясц. Саветамі дэп. працоўных).

У партыйным будаўніцтве Д. ц. аб'ядноўвае 2 найважнейшыя прынцыпы: цэнтралізм і дэмакратыю, якія цесна звязаны між сабою. Цэнтралізм забяспечвае адзінства дзеянняў, узгодненасць у рабоце ўсіх парт. арг-цый, мэтанакіраванасць дзейнасці партыі наогул. Ён забяспечваецца адзінымі праграмай, статутам, кіруючым органам у асобе з'езду партыі, а паміж з'ездамі — ЦК КПСС, падпарадкаваннем ніжэйшых арг-цый партыі вышэйшым, абавязковай для ўсіх камуністаў парт. дысцыплінай. Дэмакратызм у КПСС выяўляецца ў тым, што члены партыі самі выбіраюць кіруючыя парт. органы і кантралююць іх работу. Кожны член партыі мае права выбіраць і быць выбраным, камуністам даецца права ўдзельнічаць у дзеланым абмеркаванні пытанняў парт. палітыкі, крытыкаваць недахопы парт. работы, звяртацца з любымі пытаннямі ў розныя парт. інстанцыі, аж да ЦК КПСС. Без цэнтралізму, кантролю з боку цэнтра немагчыма сапраўдная дэмакратыя, нельга дамагчыся выканання рашэнняў большасці. Без захавання дэмакр. нормаў не можа быць дзейздольнага кіруючага парт. цэнтра, які карыстаўся б поўным даверам членаў партыі. Найважнейшым выяўленнем Д. ц. ў КПСС з'яўляюцца калектыўнасць кіраўніцтва, крытыка і самакрытыка. Паводле прынцыпу Д. ц. пабудаваны і працуюць у СССР усе грамадскія арг-цыі — Саветы дэпутатаў працоўных, прафесійныя саюзы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі і інш.

Д. ц. у кіраванні гаспадаркай — асноўны прынцып сацыяліст. гаспадарання, які дае магчымасць правільна спалучаць цэнтралізаванае дзярж. кіраванне вытворчасцю з шырокім удзелам мясцовых органаў і ўсіх працоўных. Грамадская ўласнасць на сродкі вытворчасці вызначае аб'ектыўную неабходнасць цэнтралізаванага кіравання эканомікай на аснове адзінага нар.-гасп. плана. Спалучэнне цэнтралізаванага кіравання з ініцыятывай, творчай актыўнасцю мас вызначаецца планамернасцю развіцця сацыяліст. эканомікі. Пабудова сацыялізма, адзначаў У. І. Ленін, ёсць пабудова цэнтралізаванай планавай гаспадаркі. Падтрымліваць прапарцыянальнасць нар. гасп. немагчыма без пераварэння «...усяго дзяржаўнага эканамічнага механізма ў адзіную буйную машыну, у гаспадарчы арганізм, які працуе так, каб сотні мільёнаў людзей кіраваліся адным планам...» (Ленін У. І. Тв., т. 27, с. 68).

Цэнтралізаванае планавае кіраванне сканцэнтроўваецца пераважна на распрацоўцы і забеспячэнні выканання найважнейшых паказчыкаў нар. гасп. планаў з усебаковым улікам прапаноў, якія ідуць знізу; каардынацыі і ўвязцы планаў, што

складаюцца на месцах; пашырэнні навук.-тэхн. дасягненняў і перадавога вопыту; правядзенні адзінай дзярж. палітыкі ў галіне тэхн. прагрэсу, капітальных укладанняў, размяшчэння вытворчасці, аплаты працы, цэн, фінансаў і ажыццяўлення адзінай сістэмы ўліку і статыстыкі. Д. ц. дае магчымасць больш эфектыўна выкарыстаць прадпрыемствам у выкананні дзярж. планаў (гл. *Эканамічная рэформа 1965*), уведзены новы парадак планавання с.-г. вытворчасці, дэмакратызаваны парадак складання планаў развіцця прамысловасці і буд-ва і інш. (гл. *Планаванне народнай гаспадаркі*). У спалучэнні цэнтралізму і дэмакратызму выяўляецца арган. адзінства інтарэсаў дзяржавы і народа пры сацыялізме.

Літ.: Ленін У. І. Письмо да таварыша аб нашых арганізацыйных задачах, Тв., т. 6 (Полн. собр. соч., т. 7); Ягож. Крок уперад, два крокі назад, Тв., т. 7 (там жа, т. 8); Ягож. Аб рэарганізацыі партыі, Тв., т. 10 (там жа, т. 12); Ягож. Свабода крытыкі і адзінства дзеянняў, Тв., т. 10 (там жа, т. 13); Ягож. Гл. Даведачны т. да 4 выд. Тв., ч. 1, с. 569, 578 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 1, с. 608, 611); Статут Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1966; В. И. Ленин о научных основах руководства социалистическим обществом, М., 1970. *В. С. Кубрашоў, Э. А. Юшкевіч.* Мінск.

ДЭМАКРА́ТЫЯ (грэч. dēmocratia, ад dēmos народ + kratos улада), форма паліт. арганізацыі грамадства, пры якой дзярж. ўлада ў залежнасці ад сацыяльна-эканамічнага ладу фармальна або фактычна належыць народу. У класава-антаганіст. грамадстве Д.— форма дыктатуры эксплуататарскага класа.

Пры рабаўладальніцкім ладзе Д. пашыралася толькі на рабаўладальнікаў. Пры феадалізме, якому характэрны манархічныя формы дзярж. кіравання (гл. *Манархія*), існавалі гарады-рэспублікі, у якіх улада належала або выбарным органам (у Зах. Еўропе), або вечавому сходу — *веча* (на Русі — Ноўгарад, Пскоў, Полацк). У капіталіст. грамадстве Д.— форма класавага панавання буржуазіі, пры якой абвяшчаюцца роўнасць усіх перад законам, дэмакр. правы і свабоды асобы (слова, друку, сходаў і інш.), ствараюцца парламенцкія ўстановы. Але практычна працоўныя не могуць карыстацца фармальна абвешчанымі правамі і свабодамі. Ва ўмовах капіталіст. дыскрымінацыі, адсутнасці матэрыяльных гарантый паліт. правоў і свабод большасць насельніцтва не ўдзельнічае ў грамадска-паліт. жыцці, а прадстаўнічыя ўстановы служаць інструментам палітыкі пануючага класа. Паводле вызначэння У. І. Леніна, Д. пры капіталізме астаецца «вузкай, урэзанай, фальшывай, крывадушнай, раем для багатых, лавушкай і ашуканствам для эксплуатуемых» (Тв., т. 28, с. 224). У перыяд агульнага крызісу капіталізму характэрна далейшае абмежаванне дэмакратычных правоў і свабод працоўных аж да фашызацыі грамадскага ладу. Барацьба рабочага класа за захаванне і пашырэнне Д.— састаўная частка яго класавай барацьбы за нац. незалежнасць, за сацыялізм.

Новы, вышэйшы тып Д.— сацыялістычная, зместсутнасць якой карэнным чынам адрозніваюцца ад буржуазнай. Сацыялісг. Д.— сапраўднае народаўладдзе, якое склалася ў выніку ліквідацыі эксплуататарскіх класаў і ўсталявання сацыяліст. уласнасці на сродкі вытворчасці. Яна азначае сапраўднае раўнапраўе ўсіх працоўных у паліт., эканам. і культурным жыцці грамадства незалежна ад полу, нацыянальнасці, сац. паходжання, расы, веравызнання; рэальна забяспечвае правы і свабоды грамадзян у заканадаўчым парадку матэрыяльнымі гарантыямі (гл. *Асноўныя правы і абавязкі грамадзян СССР*). Упершыню сацыяліст. тып Д.— *дыктатура пралетарыяту* — быў створаны ў СССР. Адна з формаў дыктатуры пралетарыяту — *народная дэмакратыя,* якая ўсталявалася ў шэрагу краін пасля 2-й сусв. вайны. Далейшае развіццё сацыяліст. Д. звязана з перарастаннем дзяржавы дыктатуры пралетарыяту ў *агульнанародную дзяржаву.* Найб. поўнае ўвасабленне дэмакр. характару сацыяліст. дзяржавы — *Саветы дэпутатаў працоўных.* Усебаковае развіццё сацыяліст. Д., якое ажыццяўляецца ў ходзе буд-ва камунізма, прывядзе да замены агульнанар. дзяржавы камуніст. грамадскім самакіраваннем. «Камунізм адзін толькі можа даць дэмакратыю сапраўды поўную, і чым яна паўней, тым хутчэй яна стане непатрэбпай, адамрэ сама сабой» (Ленін У. І. Тв., т. 25, с. 435).

Літ.: Маркс К. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбр. тв., т. 2, Мн., 1952; Ленін У. І. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 33); Ягож. Аб дзяржаве, Тв., т. 29 (там жа, т. 39); Ягож. О советской социалистической демократии, 2 изд., М., 1967; Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Мн., 1961; Матэрыялы XXIV з'езда КПСС, Мн., 1971; Керимов Д. А. и Чехарин Е. М. Социалистическая демократия и современная идеологическая борьба, М., 1970; Кучинский В. А. Личность, свобода, право, Мн., 1969; Шабанов Ю. В. Проблемы советской социалистической демократии в период строительства коммунизма, Мн., 1969.

Ю. М. Манін. Мінск.


ДЭМАКРАТЫЯ ЎНУТРЫПАРТЫЙНАЯ, аснова арганізацыі і дзейнасці КПСС і інш. марксісцка-ленінскіх партый, кіруючым прынцыпам якіх з'яўляецца *дэмакратычны цэнтралізм.* Асн. патрабаванні Д. ў. распрацаваны У. І. Леніным і замацаваны ў Праграме і Статуце КПСС. Д. ў. азначае: выбарнасць, справаздачнасць усіх кіруючых органаў партыі знізу даверху, калегіяльнасць у іх рабоце; удзел парт. мас у кіраўніцтве парт. жыццём, рэгулярнае правядзенне сходаў пярвічных парт. арг-цый, парт. канферэнцый і з'ездаў, сходаў парт. актыву, пленумаў парт. к-таў; разгортванне крытыкі і самакрытыкі, пастаянную сувязь парт. кіраўнікоў з камуністамі, сістэматычнае расшырэнне і ўмацаванне сувязі партыі з працоўнымі масамі.

Д. ў. забяспечвае роўнасць у правах і абавязках усіх членаў партыі. Кожны член партыі мае права ўдзельнічаць у дзеланым абмеркаванні пытанняў парт. палітыкі на парт. сходах ці ў парт. друку; крытыкаваць на парт. сходах любога работніка партыі, выбраць і быць выбраным у парт. органы; звяртацца з любымі пытаннямі і заявамі ў любую парт. інстанцыю аж да ЦК КПСС. Д. ў. садзейнічае паспяховаму выкананню Праграмы і Статута партыі, рашэнняў вышэйшых органаў, захаванню свядомай парт. дысцыпліны, барацьбе за ахову адзінства партыі, павышэнню баяздольнасці партыі, яе авангардпай ролі ў барацьбе за камунізм.

Літ.: Ленін У. І. Што рабіць?, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 6); яго ж. Да адзінства!, Тв., т. 11 (там жа, т. 13); яго ж. Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме, Тв., т. 31 (там жа, т. 41); гл. таксама літ. пры арт. *Дэмакратычны цэнтралізм.*

В. С. Кудрашоў.

ДЭМАКРЫТ (Dēmókritos) з Абдэры (каля 460—370 да н. э.), старажытнагрэчаскі філосаф-матэрыяліст. Вучань заснавальніка старажытнагрэч. атамістыкі Леўкіпа. Па вызначэнні К. Маркса, «быў першым энцыклапедычным розумам сярод грэкаў» (Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 3, с. 126). Напісаў каля 70 твораў па філасофіі, фізіцы, матэматыцы, фізіялогіі, медыцыне, тэорыі музыкі і інш.; ад іх збераглісятолькі ўрыўкі. Вучэнне Д.— першая распрацаваная ў асн. палажэннях сістэма антычнага матэрыялізму. У. І. Ленін назваў Д. буйнейшым матэрыялістам. лінію ў развіцці гісторыі філасофіі лініяй Дэмакрыта (гл. Тв., т. 14, с. 117). Д. сцвярджаў, што ўсё існае складаецца з атамаў — найдрабнейшых і непадзельных часцінак — і пустаты, у якой яны рухаюцца. Злучэнні розных атамаў утвараюць усю разнастайнасць прыроды, і нішто не паходзіць з нічога. Крыніца нашых ведаў — пачуцці, аднак сутнасць рэчаў пазнаецца толькі розумам. Па сацыяльна-паліт. поглядах Д.— ідэолаг рабаўладальніцкай дэмакратыі. У этыцы прапаведаваў «залатую сярэдзіну» — памяркоўнасць ва ўсім.



Тв.: Рус. пер. у кн.— Демокрит в его фрагментах и свидетельствах древности, [М.], 1935; Лурье С. Я. Демокрит. Тексты, перевод, исследования, Л., 1970.

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Из ранних произведений, М., 1956; Лурье С. Я. Демокрит, М., 1937; Асмус В. Ф. Демокрит, М., 1960.

ДЭМАН (грэч. dáimon дух, бог), у міфалогіі і рэлігіі старажытных грэкаў надпрыродная сіла, дух. У іудаізме і хрысціянстве — нячысты дух, чорт, у ісламе — джын і інш. Вера ў Д. ўзнікла са спробай растлумачыць з'явы прыроды.

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНАЯ, адна з масавых формаў выяўлення грамадскага настрою. У бурж. умовах рабочы клас выкарыстоўвае Д. п. як сродак барацьбы за свае класавыя інтарэсы супраць імперыялізму, за мір, дэмакратыю, нац. незалежнасць, сацыялізм. Ва ўмовах сацыялізма — форма выяўлення волі і энтузіязму нар. мас.

Першая сацыяльна-рэвалюц. дэманстрацыя ў Расіі арганізавана рабочымі і студэнтамі ў снеж. 1876 у Пецярбурзе. Да 1895 у Расіі Д. п. адбываліся без удзелу сацыялістаў. У 1896 *Пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа»* правёў стачку некалькіх дзесяткаў тысяч рабочых з удзелам с.-д. арг-цыі, з вулічнай агітацыяй. У Д. п. ператвараліся рабочыя святкаванні. У 1895 1 Мая адзначылі рабочыя Мінска, Гродна, Смаргоні. Летам 1899 адбылася Д. п. ў Віцебску (больш за 1000 чал.), рабочыя ішлі пад лозунгам «Далоў самадзяржаўе!». У 1900 у першамайскай Д. п. у Мінску ўдзельнічала больш за 500 чал. У 1905 Д. п. часта перарасталі ў паўстанні. Пасля Кастр. рэвалюцыі шматмільённыя Д. п. адлюстроўваюць маральна-паліт. адзінства сав. народа, Камуніст. партыі і Сав. ўрада, энтузіязм працоўных у буд-ве камунізма. У СССР Д. п. адбываюцца ў гадавіны Вял. Кастр. сацыялістычнай рэвалюцыі, 1 Мая і ў інш. святы ці ў час выдатных паліт. падзей. Аналагічны характар маюць Д. п. ў сацыяліст. краінах.

Літ.: Ленін У. І. Пачатак дэманстрацый, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 5); яго ж. Першы ўрокі, Тв., т. 8 (там жа, т. 9); яго ж. Урокі Маскоўскага паўстання, Тв., т. 11 (там жа, т. 13); Дакументы міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Масква, 5—17 чэрв. 1969 г., Мн., 1969.

С. Л. Саламаха. Мінск.

ДЭМАРКАЦЫЙНАЯ ЛІНІЯ, лінія, зона ці палоса, якая падзяляе войскі праціўнікаў або саюзнікаў пры заканчэнні ваенных дзеянняў да вызначэння пастаяннай граніцы паводле пагаднення ці мірнага дагавору.

ДЭМАРКАЦЫЯ ГРАНІЦ, дакладнае вызначэнне лініі дзярж. граніцы на мясцовасці спец. пагранічнымі знакамі. Звычайна робіцца камісіямі з прадстаўнікоў зацікаўленых дзяржаў.

ДЭМАСФЕН (Dēmosthénēs; каля 384—12.10.322 да н. э.), старажытнагрэчаскі прамоўца, паліт. дзеяч, ідэолаг афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі. З сям'і багатага рамесніка. Аратарскае майстэрства зрабіла Д. выдатнай фігурай свайго часу (прамовы супраць македонскага цара *Філіпа II* — філіпікі). Рэзка выступаў супраць захопніцкай палітыкі Македоніі, дамогся стварэння антымакедонскай кааліцыі грэч. полісаў. Пасля паражэння грэкаў у Ламійскай вайне 323—322 да н. э., ратуючыся ад праследавання ворагаў, скончыў самагубствам.

Тв.: Рус. пер.— Речи, М., 1954.

ДЭМБІНСКІ (Dembiński) Генрык (16.1.1791, Кельцы — 13.6.1864), польскі паліт. дзеяч, генерал, удзельнік паўстання 1830—31. З шляхты. Скончыў інж. акадэмію ў Вене. У час паўстання летам 1831 намагаўся ўзяць Вільню і Шаўлі, вывеў з Літвы да Варшавы атрад (каля 4 тыс. чал.), адрэзаны царскімі войскамі. Выступаў супраць удзелу пар. мас у паўстанні. Пасля разгрому паўстання ў эміграцыі. Удзельнік рэвалюцыі 1848—49 у Аўстра-Венгрыі. Аўтар успамінаў пра паўстанне і рэвалюцыю.

Літ.: История Польши, т. 1, М., 1956.

ДЭМБІНСКІ Генрык (30.7.1908, г. Іркуцк — 12.8.1941), удзельнік рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі, публіцыст. З рабочых. Пасля 1-й сусв. вайны жыў у Ашмянах. З канца 1932 у Віленскім ун-це на чале антыфаш. групы «Студэнцкая лявіца «Фронт», якая аб'ядноўвала прагрэс. моладзь і была пад уплывам КПЗБ. У 1935 адзін з заснавальнікаў легальнай антыфаш. студэнцкай газеты «Poprostu» («Патыфаш. студэнцкай газеты «Poprostu» («Папросту»). Удзельнік Антыфашысцкага кангрэсу работнікаў культуры ў Львове 16—17.5.1936. У 1937 засуджаны на 4 гады турмы. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР інспектар раённага аддзела нар. асветы. Расстраляны ням. акупантамі ў Ганцавічах.

Тв.: Wybór pism, Warszawa, 1962.

Літ.: Революционный путь компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966 (гл. Паказальнік імён).

Я. Ф. Шорахаў. Мінск.

ДЭМБІЦКІ Мікалай Уладзіслававіч [н. 30.8(11.9).1899, г. Чарнігаў], беларускі савецкі эканаміст. Д-р эканам. н. (1970), праф. (1961). Чл. КПСС з 1967. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Усесаюзны завочны фін. ін-т (1932). З 1947 у Бел. дзярж. ін-це нар. гасп. імя Куйбышава, з 1964 заг. кафедры эканам. аналізу і механізацыі ўліку. Гал. кірунак навук. работы: бух. ўлік, эканам. аналіз дзейнасці прамысл. прадпрыемстваў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: Анализ затрат на производство продукции промышленного предприятия, Мн., 1956; Теория советского бухгалтерского учета, Мн., 1957; Основные теоретические проблемы науки о бухгалтерском учете, Мн., 1960; (у сааўт.) Экономический анализ деятельности промышленных предприятий, Мн., 1968; (разам з С. Р. Аўслянікавым). Основы бухгалтерского учета, 2 изд., М., 1970.

ДЭМБРАВА, вёска ў Шчучынскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Спушанка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Расія». За 23 *км* на З ад Шчучына, 75 *км* ад Гродна, 19 *км* ад чыг. ст. Скідаль. 363 ж., гасп. 121 (1971). Шавецкая і швейная майстэрні. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адд. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ДЭМІЛІТАРЫЗАЦЫЯ ТЭРЫТОРЫІ, забарона якой-н. дзяржавай мець войскі, захоўваць старыя ці будаваць новыя ваенныя базы, умацаванні на пэўнай тэрыторыі. Вызначаецца міжнар. дагаворамі.

ДЭМІРЧАН Дэрэнік Карапетавіч [6(18).2.1877, г. Ахалкалакі (Грузія) — 6.12.1956], армянскі савецкі пісьменнік. Засл. дз. маст. Арм. ССР (1940). Акад. АН Арм. ССР (1953). Скончыў Жэнеўскі ун-т (1909). Настаўнічаў у Тбілісі (1910—22). З 1925 жыў у Ерэване. Друкавацца пачаў у 1893 (першы зб. вершаў выдаў у 1899). У 20—30-я г. пісаў пра барацьбу працоўных Арменіі за новае жыццё (аповесці «Рашыд», «Трое», сатыр. камедыя «Напалеон Каркацян», драма «Фасфарычнае зяранне»). У Айч. вайну напісаў шэраг апавяданняў, прасякнуты ідэяй патрыятызму гістар. раман «Вардананк» (т. 1—2, 1943—46). Аўтар драмы-казкі «Храбры Назар» (1923), гістар. п'есы «Краіна родная» (1938, паст. 1940), пяскончанага рамана «Месроп Маштоц» (нап. ч. 1, 1956) пра выдатнага арм. асветніка і вучонага 4—5 ст., артыкулаў па літ.-, мова- і мастацтвазнаўстве, гістарыяграфіі. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Кветкі Арарата, Мн., 1964; рус. пер.— Вардананк, кн. 1—2, М., 1961; Чаргай. Рассказы, Ереван, 1956; Во имя жизни. Рассказы, М., 1964.

Літ.: Мурадян Г. Б. Дереник Демирчян, Ереван, 1956.

ДЭМІЎРГ (ад грэч. dēmiurgós майстар, стваральнік), у Ст. Грэцыі так называлі рамеснікаў, майстроў, урачоў, мастакоў або вышэйшых службовых асоб. У ідэаліст. філасофіі Платона — ідэальная першааснова, якая стварае свет. У рэлігіі адно з азначэнняў бога.

ДЭМПІНГ (англ. dumping скідванне), у капіталістычных краінах продаж тавараў на знешніх рынках па цэнах, ніжэйшых, чым на ўнутраным рынку. Сродак барацьбы манаполій за рынкі збыту.

Страты ад Д. кампенсуюцца продажам тавараў па высокіх цэнах на ўнутраным рынку або субсідыяй дзяржавы, таму Д. вядзе да абагачэння манаполій за кошт працоўных. У эпоху імперыялізму Д. набывае масавы характар. Пасля 2-й сусв. вайны сістэматычны дэмпінгавы экспарт праводзяць манаполіі ЗША.

ДЭМПФЕР (ням. Dämpfer гасільнік ваганняў), прыстасаванне для заспакойвання мех. ваганняў розных сістэм і канструкцый.

Падзяляюцца на фрыкцыйныя і дынамічныя. Фрыкцыйныя Д. заспакойваюць ваганні ператварэннем энергіі ваганняў у работу трэння (сухога ці вадкаснага), якое ствараецца паміж элементамі Д. Дзеянне дынамічных Д. заснавана на змене частаты ўласных ваганняў сістэмы адносна частаты ваганняў вонкавых сіл, каб папярэдзіць небяспечны рэзананс сістэмы. Паводле канструкцыі Д. бываюць мех., гідраўл., пнеўматычныя, эл.-магн. і інш. Выкарыстоўваюцца ў рухавіках унутр. згарання, у эл. машынах, электравымяральных прыладах і інш. У мнагаструнных муз. інструментах Д. ужываецца, каб спыніць ваганні струн. Гл. таксама *Амартызатар.*

Літ.: Ильинский В. С. Защита аппаратов от динамических воздействий, М., 1970; Сергеев С. И. Демпфирование механических колебаний, М., 1959.

ДЭНАМІНАЦЫЯ (*дэ*...+лац. nominatio найменне), зніжэнне намінальнай вартасці грашовых знакаў для ўпарадкавання *грашовага абарачэння* і спрашчэння разлікаў. Пры Д. грашовыя знакі ранейшага выпуску абменьваюцца на новыя, выражаныя ў больш буйных надліковых адзінках; адпаведна пералічваюцца цэны і заработная плата. Д. ў СССР, якая адбылася ў 1921 і 1922, падрыхтавала ўмовы для стабілізацыі рубля і ажыццяўлення грашовай рэформы 1922—24. Капіталістычныя краіны ўжываюць Д. для аслаблення *інфляцыі.*

ДЭНАНСАЦЫЯ (франц. dénonciation), у міжнар. праве скасаванне дагавору паміж дзяржавамі ў адпаведнасці з яго ўмовамі. Заява пра Д. не разглядаецца як недружалюбнае дзеянне. У пераносным сэнсе Д. часам наз. аднабаковае спыненне дагаворных адносін.

ДЭНАРЫЙ (лац. denarius), сярэбраная манета Ст. Рыма і некаторых еўрап. краін у сярэднія вякі.

Упершыню выпушчана ў 269 да н. э., маса 4,55 *г*, пазней 3,9 *г* (217 да н. э.), 3,41 *г* (89 да н. э.). На тэр. Беларусі была ў абарачэнні ў канцы 1—3 ст. н. э. У Еўропе (герм. пфеніг, англа-саксонскі пені, франц. дэнье, польск. дэнар і г. д.) масаю ад 1,5—1,7 *г* (10 ст.) да 1 *г* і меней (11—12 ст.). У Ст. Русі Д. змяніў куфіцкі дырхем і пашырыўся ў пач. 11 ст., хоць самы стараж. ўсх.-еўрап. скарб Д. (в. Стары Дзедзін, Магілёўская вобл.) адносіцца да 980—985. У 1-й пал. 11 ст. ў абарачэнні былі германскія, англа-саксонскія, радзей венгерскія, чэшскія, паўн.-італьянскія, скандынаўскія і інш. Д.; у 2-й пал. 11 — пач. 12 ст. германскія, радзей чэшскія, хоць у скарбе каля в. Дзягцяны Мінскай вобл. з 320 манет 123 чэшскія Д. На тэр. Беларусі існавалі да сярэдзіны 60-х г. 11 ст. літоўскія і польскія білонныя манеты 14 — сярэдзіны 17 ст. масаю менш за 1 *г*. У 2-й пал. 17 ст. самы дробны намінал, які складаў $^1/_{18}$ польск. гроша.

Літ.: Янин В. Л. Денежно-весовые системы русского средневековья. Домонгольский период, М., 1956; Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970; Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968.

В. Н. Рабцэвіч. Мінск.

ДЭНАЦЫФІКАЦЫЯ, працэс ачышчэння грамадска-паліт. і эканам. жыцця Германіі ад вынікаў фаш. рэжыму; ажыццяўляўся, каб палегчыць дэмакр. пераўтварэнні ў краіне. Рашэнні *Крымскай канферэнцыі 1945* і *Патсдамскай канферэнцыі 1945* аб Д. прадугледжвалі знішчыць нацыянал-сацыялістычную партыю, яе філіялы і падкантрольныя арг-цыі; распусціць усе нацысцкія ўстановы і не дапусціць іх адраджэння ў якой бы там ні было форме; не дапускаць нацысцкай дзейнасці і прапаганды; прыцягнуць да адказнасці ваен. злачынцаў, актыўных нацыстаў і вінаватых у злачынствах супраць міру і чалавечнасці; выдаліць нацыстаў з усіх адказных пасад; адмяніць фаш. заканадаўства і г. д. Міжнар. ваен. трыбунал у Нюрнбергу засудзіў ням. ваен. злачынцаў, абвясціў злачынным кіраўніцтва нацыянал-сацыялістскай партыі, гестапа, СД і СС. У сав. зоне акупацыі Д. праводзілася спец. камісіямі з прадстаўнікоў антыфаш. партый і прафсаюзаў (закончана ў сак. 1948). З розных органаў кіравання было звольнена 520 тыс. актыўных нацыстаў. У амер., англ. і франц. зонах акупацыі мерапрыемствы па Д. фактычна сарваны. У Зах. Германіі створаны неафаш. нацыянал-дэмакр. партыя і розныя рэваншысцкія арг-цыі, у 1958 у ФРГ афіц. адменена забарона нацыянал-сацыялістскай партыі. Адмова зах. дзяржаў ад наслядоўнай Д.— адна з прычын расколу Германіі і адраджэння ў ФРГ сіл мілітарызму і рэваншу.

Літ.: Дерибер г С. Рождение новой Германии. 1945—1949, пер. с нем., М., 1962; Правда о политике западных держав в германском вопросе (истор. справка), М., 1959; За антифашистскую демократическую Германию. Сб. документов 1945—1949, М., 1969. *В. П. Жукаў.* Мінск.

ДЭНГОФ Станіслаў Эрнест (каля 1673 — 2.8. 1728), дзярж. дзеяч Вял. кн. Літоўскага. У 1702—04 узначальваў т. зв. Сандамірскую канфедэрацыю, якая аб'яднала асн. масу польска-літ. феадалаў вакол караля Аўгуста II супраць швед. войска і іх стаўленіка Станіслава Ляшчынскага; з дапамогай рус. войск вёў з імі барацьбу. З 1709 гетман польны літоўскі, з 1717 ваявода полацкі.

ДЭНДРАЛОГІЯ (грэч. déndron дрэва+...*логія*), раздзел батанікі, навука пра дрэвы і кусты. Вывучае марфалогію, сістэматыку, экалогію дрэўных і кустовых раслін, іх выкарыстанне ў нар. гаспадарцы. Цесна звязана з інш. раздзеламі батанікі, лесаводствам, лесамеліярацыяй, поле- і глебаахоўным лесаразвядзеннем, акліматызацыяй і інтрадукцыяй, селекцыяй і насенняводствам.

Дадзеныя Д. выкарыстоўваюцца пры стварэнні лясных насаджэнняў, *дэндрарыяў*, батанічных садоў, паркаў і інш. аб'ектаў азялянення будаўніцтва. Дэндралагічныя работы ў СССР ажыццяўляюцца ў АН СССР і яе філіялах, акадэміях саюзных рэспублік, у НДІ лясной гаспадаркі, бат. садах, запаведніках, на лясных доследных станцыях. Курс Д. выкладаецца ў лесагаспадарчых, лесатэхнічных ВНУ і лясных тэхнікумах. На Беларусі пытанні Д. вывучаюцца ў Ін-це эксперым. батанікі АН БССР, Цэнтр. бат. садзе АН БССР і інш. навук. установах.

Літ.: Дендрология с основами лесной геоботаники, под общ. ред. В. Н. Сукачева, Л., 1934; Гроздов Б. Н. Дендрология, 2 изд., М.—Л., 1960; Интродуцированные деревья и кустарники в Белорусской ССР, в. 1—3, Мн., 1959—61; Деревья и кустарники СССР, М., 1966; Шкутко Н. В. Хвойные экзоты Белоруссии и их хозяйственное значение, Мн., 1970. *А. Ф. Іваноў.* Мінск.

ДЭНДРАРЫЙ, дэндралагічны сад (грэч. déndron дрэва), арбарэтум (лац. arbor дрэва), участак батанічнага саду, дзе ў адкрытым грунце культывуецца калекцыя дрэў і кустоў.

Расліны ў Д. размяшчаюцца з улікам геагр. паходжання і сістэматычнай прыналежнасці. Д. ілюструюць багацце і разнастайнасць дрэўнай флоры, служаць базай для навуч. мэт, н.-д. работы па інтрадукцыі, акліматызацыі і селекцыі дрэўнакустовых раслін, усебакова спрыяюць пашырэнню рэдкіх і гаспадарча каштоўных відаў. У СССР найб. багатыя калекцыі дрэўных парод у Гал. бат. садзе АН СССР (Масква), Ніцыцкім (каля Ялты), Сухумскім і Батумскім бат. садах (Грузія), у дэндралагічным садзе Лесатэхнічнай акадэміі імя Кірава (Ленінград). За мяжою найб. вядомыя Д. бат. саду ў К'ю каля Лондана, Д. Гарвардскага ун-та ў Востане (ЗША), дэндралагічны сад у Мустыла (Фінляндыя). На Беларусі самы вялікі Д. (больш за 1350 відаў і формаў дрэўных і кустовых раслін) у Цэнтр. бат. садзе АН БССР. Есць Д. у Горках Магілёўскай вобл., у Брэсце, Віцебску, Гродне і інш. гарадах рэспублікі. Каля 300 відаў раслін у Д. Глыбоцкага лясгаса Віцебскай вобл.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэндралогія.*

ДЭНДРЫТ (ад грэч. déndron дрэва), незакончаны ў развіцці крышталь, формаю падобны на галінастае дрэва, папараць, ігліцу.



Дэндрыт самароднага золата.

Утвараецца пры нізкатэмпературнай хуткай крышталізацыі мінералаў у прыродных умовах або расплавах у металург. працэсе. Форму Д. маюць многія мінералы (вокіслы жалеза і марганцу), лёд (снежынкі, марозныя ўзоры на вокнах), самародныя металы (медзь, серабро, золата).

Літ.: Саратовкин Д. Д. Дендритная кристаллизация, 2 изд., М., 1957.

ДЭНІ (сапр. Дэяні-саў) Віктар Мікалаевіч [24.2(8.3).1893, Масква — 3.8.1946], рускі савецкі графік, карыкатурыст, адзін з заснавальнікаў сав. палітычнага плаката. Засл. дз. маст. РСФСР (1932). Вучыўся ў М. Ульянава. З 1910 выступаў у друку; з 1921 пастаянны карыкатурыст газ. «Правда». Творы: плакаты — «Антанта», «Селянін! Польскі памешчык хоча арабіць цябе рабом...» (абодва 1919), «Установчы сход» (1919, выдрукаваны 1921), «На магіле контррэвалюцыі», «Капітал», «Пад маскаю міру» (усе 1920), «Памажы!» (1928), «Ідуць да гібелі свайі» (1937), «На Маскву! Хох! Ад Масквы: ох!» (1941); малюнкі — «Здань блукае па Еўропе» (1924), «На барацьбу з беспрытульнасцю» (1926) і інш.

Літ.: Свиридова И. Виктор Николаевич Дени, М., 1958.

ДЭНІС (Dennis) Юджын (10.8.1904, г. Сіэтл — 31.1.1961), дзеяч амерыканскага і міжнар. рабочага руху. Прац. дзейнасць пачаў у 13 гадоў. З 1927 чл. кампартыі ЗША, быў на адказнай парт. рабоце ў Паўд. Каліфорніі, Пенсільваніі. З 1938 чл., у 1946—57 ген. сакратар Нац. камітэта кампартыі. У 1950—55 зняволены, з 1955 воўк на парт. рабоце. У 1957—59 сакратар, са снеж. 1959 старшыня Нац. камітэта кампартыі ЗША.

Тв.: Рус. пер.— Статьи и речи (1947—1951), М., 1952; Письма из тюрьмы, М., 1957.

ДЭНІТРЫФІКАЦЫЯ [*дэ*...+nitr(ogen) новалац. азот+...*фікацыя*], узнаўленне мікраарганізмамі нітратаў глебы да газападобнага азоту.

Выклікаецца дэнітрыфікавальнымі бактэрыямі (Bact. denitrificans, Achromobacter Stutzeri, Pseudomonas fluorescens, Pseudom. pyocoanea) на ўмовах высокай вільготнасці, дрэннай аэрацыі глебы і лішку бязвоцістых арган. рэчываў (вуглявадаў, солей розных арган. к-т, некат. спіртоў, якія спажываюцца мікраарганізмамі як крыніца вуглероду). Дэнітрыфікатары выкарыстоўваюць кісларод нітратаў для акіслення арган. рэчываў, а энергію акіслення — для свайй жыццядзейнасці. Д. шкодная с. гасп. (робіць глебу бедней па азоце). Рыхленне глебы стрымлівае гэты працэс. Пры палучнасці кіслароду ў глебе дэнітрыфікатары могуць ажыццяўляць *аманіфікацыю*.

Літ.: Федоров М. В. Микробиология, 7 изд., М., 1963; Корсакова М. П. Денитрифицирующие бактерии, «Микробиология», 1948, т. 17, в. 6. *А. А. Навубчык.* Жодзіна.

ДЭНУДАЦЫЯ (лац. denudatio аголенне), сукупнасць працэсаў разбурэння горных парод, пераносу і намнажэння іх у больш нізкіх месцінах. Адбываецца ў выніку выветрывання горных парод, геал. дзейнасці водных патокаў (гл. *Эразія*), ледавікоў (гл. *Экзарацыя*), ветру (гл. *Дефляцыя*), падземных водаў (гл. *Суфозія*), марскіх і азёрных хваляў і цячэнняў (гл. *Абразія*). Д. выклікае агладжванне рэльефу зямной паверхні і ўтварэнне дэнудацыйнага (другаразовага) рэльефу.

ДЭПАЗІТ (ад лац. depositum рэч, аддадзеная на абярожанне), грашовыя сумы ці каштоўныя паперы, якія ўносяцца на абярожанне ў дзярж. ці крэдытныя ўстановы з правам атрымаць іх назад.

ДЭПАНЕНТ, дэпазітар (ад лац. deponо кладу), 1) фізічная або юрыдычная асоба, якая здала каштоўнасці ў *дэпазіт*. 2) Асоба, якой не выплачана прадпрыемствам, установай ці арг-цыяй грашовая сума (напр., рабочым і служачым, што на якіх-н. прычынах не атрымалі своечасова зарплаты).

ДЭПО (франц. dépôt склад), транспартнае прадпрыемства, прызначанае абслугоўваць, рамантаваць і эксплуатаваць рухомы састаў чыгунак (лакаматыўныя і вагонныя Д.), гарадскога наземнага (трамвайныя і тралейбусныя паркі) ці падземнага (метро) электратранспарту і інш.

ДЭПРЭСІЯ (лац. depressio прыгнечанне), у эканоміцы капіталізму фаза прамысл. цыкла, якая настае за крызісам перавытворчасці і характарызуецца застоем гаспадаркі. У перыяд Д. спад вытворчасці спыняецца, аднак яна астаецца на нізкім узроўні. Прадпрыемствы недагружваюцца, пануе беспрацоўе, попыт на тавары слабы. Гл. таксама *Цыкл капіталістычны.*

ДЭПРЭСІЯ (у медыцыне), псіхічная прыгнечанасць з затарможанасцю мыслення, мовы і рухаў. Прыкметы: паніжаны настрой (гіпатымія) да глыбокай тугі з трызненнем, нерухомасцю, самаабвінавачваннем. Бывае пры псіхічных і саматычных хваробах, найб. тыповая ў дэпрэсіўнай фазе *маніякальна-дэпрэсіўнага псіхозу.*

ДЭПУТАТ, выбарны член прадстаўнічага дзярж. органа. У СССР — член Саветаў дэпутатаў працоўных (ад сельскага і гарадскога да Вярх. Савета СССР). Паводле Канстытуцыі СССР, канстытуцый саюзных і аўт. рэспублік Д. можа быць выбраны кожны грамадзянін СССР незалежна ад расавай і нац. прыналежнасці, полу, веравызнання, адукацыі, аселасці, сац. паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці, калі яму споўнілася 18 гадоў — у мясцовыя Саветы, 21 — у Вярх. Савет саюзнай і аўт. рэспублікі, 23 — у Вярх. Савет СССР. Выбіраецца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Д. у СССР — дзярж. дзеяч. Актыўна ўдзельнічае ў рабоце прадстаўнічага органа, у які выбраны: выносіць на разгляд Савета пытанні, што ўваходзяць у яго кампетэнцыю, можа быць выбраны ў створаныя Саветам камісіі і інш. органы. Не можа быць арыштаваны ці прыцягнуты да суд. адказнасці без згоды Савета, членам якога з'яўляецца, ці выканаўчага органа адпаведнага Савета. Падтрымлівае сувязь з сваімі выбаршчыкамі, перыядычна робіць перад імі справаздачу пра сваю работу, выконвае іх наказы і прапановы, разглядае скаргі і заявы працоўных. Тэрмін паўнамоцтваў Д. Вярх. Савета СССР, саюзных і аўт. рэспублік 4 гады, мясцовых — 2. Калі Д. не апраўдвае даверу, ён можа быць адкліканы да канца тэрміну рашэннем большасці выбаршчыкаў. Гл. таксама *Выбарчая сістэма, Вярхоўны Савет СССР, Вярхоўны Савет Беларускай ССР.* *А. В. Сабалеўскі.* Мінск.

ДЭРАТЫЗАЦЫЯ (*дэ*...+франц. rat пацук), знішчэнне шкодных грызуноў (мышэй, пацукоў, палёвак, суслікаў, суркоў, бурундукоў), якія псуюць пасевы, харч. прадукты, фураж, тару, пераносяць узбуджальнікаў інфекц. хвароб чалавека і жывёл (тулярэмію, бруцэлёз, лептаспіроз, туберкулёз і інш.). Д. уключае комплекс прафілактычных і зніштчальных мерапрыемстваў, яе робяць на жывёлагадоўчых формах, на палях, агародах, у садах; на чыг. і марскім транспарце, у населеных пунктах. Метады Д.— хімічныя, біялагічныя і механічныя.

Літ.: Поляков А. А. Ветеринарная дезинфекция, 3 изд., М., 1964.

ДЭРМАТАГЛІФІКА (ад лац. dérma скура+ +glyphe гравіраваць), навука пра скурныя малюнкі далоняў і падэшваў у чалавека і ў некаторых малпаў.

Пра тое, што пальцы рук і ног, далоні і падэшвы чалавека маюць уласны, непаўторны малюнак скуры, ведалі яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Таму ў некат. старав. дзяржавах адбіткамі пальцаў заменьвалі подпісы. Першыя навук. паведамленні пра малюнкі скуры трапляюцца ў анатамічных працах 17 ст. У 1823 чэшскі вучоны Ян Пуркінье даў першую навук. класіфікацыю скурных малюнкаў. Індывідуальнасць, аднаўляльнасць і пазменнасць скурных малюнкаў незалежна ад узросту, перадача па спадчыне іх асн. элементаў даюць магчымасць выкарыстоўваць Д. у крыміналістыцы (гл. *Дактыласкапія*), параўнальнай анатоміі, эмбрыялогіі. Этнічная Д. вывучае варыяцыі скурных малюнкаў у розных рас. Д. народаў СССР займаюцца супрацоўнікі кафедры антрапалогіі МДУ імя Ламаносава і Ін-та этнаграфіі АН СССР. Даследаванні па Д. беларусаў вядуцца ў сектары этнаграфіі Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і ў Брэсцкім пед. інстытуце.

Літ.: Гладкова Т. Д. Кожные узоры кисти и стопы обезьян и человека, М., 1966; Теглано Л. Н. Дерматоглифика белорусов, «Советская этнография», 1970, № 3. *Л. І. Цівака.* Мінск.

ДЭРМАТАЛО́ГІЯ (грэч. dérma скура + *...логія*), навука пра скуру. Падзяляецца на агульную і прыватную. Агульная вывучае марфалогію, фізіялогію і біяхімію скуры, заканамернасці развіцця скурных хвароб, прынцыпы іх дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі, прыватная — асобныя скурныя хваробы. Звязана з венералогіяй, педыятрыяй, акушэрствам, хірургіяй, неўрапаталогіяй.

Навук. Д. ўзнікла ў 2-й пал. 18 ст., калі была распрацавана марфалагічная класіфікацыя хвароб скуры (аўстр. вучоныя І. І. Пленк, Ф. Гебра і англічанін Р. Уілен). У Расіі кафедра скурных хвароб адкрыта ў 1869 пры медыка-хірург. акадэміі ў Пецярбурзе. На чале яе стаяў А. Г. Палацебнаў, які заснаваў фізіял. кірунак у Д. і адкрыў (з В. А. Манасеіным) лекавыя якасці зялёнай плесні (гл. *Пеніцылін*). Вялікі ўклад у развіццё Д. зрабілі рус. вучоныя: Ц. П. Паўлаў развіў ідэі нервізму ў Д., А. І. Паспелаў распрацаваў методыку касметычнага масажу, лячэнне саркомы прэпаратамі мыш'яку, П. В. Нікольскі — фенамен адслойвання эпідэрмісу пры лістападобнай пузырчатцы. Сав. практычная і навук. Д. дасягнула значных поспехаў у барацьбе з туберкулёзам скуры (В. М. Падвысоцкая, А. С. Сахноўская), лепрай (В. І. Кедроўскі, М. А. Тарсуля і інш.), гнайнічковымі (С. Л. Багроў, М. С. Смелаў, М. Ц. Брыль, М. П. Батуніч), грыбковымі (М. А. Чарнагубаў, А. М. Арыевіч) і прафес. хваробамі (У. І. Іваноў, М. П. Батуніч, А. П. Даўганаў) і інш.

У БССР распрацаваны метады лячэння чырвонай ваўчанкі акрыхінам і некаторых інш. хвароб скуры ультрагукам, даследаваны ўплыў рэнтгенаўскіх прамянёў і ультрагуку на хваробы скуры і абмен рэчываў пры дэрматозах (А. Я. Пракапчук, Л. І. Багдановіч, Л. І. Гакіпаева). У СССР працуе Усесаюзнае т-ва дэрмата-венералагаў, якое кіруе дзейнасцю рэсп. т-ваў.

Выдаюцца часопісы: «Вестник дерматологии и венерологии» (СССР), «The Journal of investigative Dermatology» («Часопіс па навуковай дэрматалогіі», ЗША), «Annales de Dermatologie etde Syphiligraphie» («Аналы па дэрматалогіі і сіфілігафіі», Францыя), «Dermatologische Monatsschrift» («Дэрматалагічны штомесячнік», ГДР), «Československa dermatologie» («Дэрматалогія Чэхаславакіі», ЧССР).

Літ.: История медицины СССР, М., 1964 (бібліягр.); Богданович Л. И. Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967; Здравоохранение Белорусской ССР за сорок лет (1919—1958). Указатель литературы, Мн., 1961; гл. таксама літ. пры арт. *Венералогія*.

Л. І. Багдановіч. Віцебск.

ДЭРМАТО́ЗЫ (грэч. dérma скура), в ы с ы п к і, прыроджаныя і набытыя паталагічныя працэсы ў скуры і яе прыдатках (валасах, пазногцях). Выклікаюцца экзагеннымі прычынамі (хім., мех., біял.) і эндагеннымі (агульныя інфекцыйныя хваробы, ачаговыя інфекцыі, інтаксікацыі), парушэннямі абмену рэчываў, рэактыўнасцю арганізма, нястачай вітамінаў. Д. паражаюць увесь арганізм або асобныя органы і сістэмы. Лячэнне агульнае (прычыннае) і мясцовае (сімптаматычнае).

Літ.: Богданович Л. И. Ультразвук при лечении кожных болезней, 2 изд., Мн., 1967; Павлов С. Т. Кожные и венерические болезни, Л., 1969.

А. П. Комай. Мінск.

ДЭРМАТЫ́Т (грэч. dérma скура), запаленне скуры. Бывае 2 відаў: просты — ад дзеяння на скуру пэўных раздражняльнікаў (механічных — доўгае трэнне, біялагічных — кляшчы, тэмпературных — апёкі, абмаражэнні, хімічных — к-ты, шчолачы, прамяпёвых — сонечныя прамяні, радыяцыя) і алергічны — паяўляецца ад паўторных уздзеянняў раздражняльнікаў [некат. фарбы (урсол), медыкаменты (сульфаніламіды, параамінабензойная к-та), пральныя парашкі, якія выклікалі сенсібілізацыю арганізма. Прыкметы Д.: пачырваненне, прыпухласць, пухіры, боль, сверб, пякота. Лячэнне: ліквідацыя прычын, што выклікалі хваробу, мясцова — процізапаленчыя сродкі.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэрматозы*. *А. П. Комай*. Мінск.

ДЭРЫВА́ЦЫЯ (лац. derivatio адвядзенне, адхіленне), 1) у гідратэхніцы — сукупнасць абходных вадаводаў, па якіх вада адводзіцца з ракі ці вадаёма для суднаходства, энергетыкі або ірыгацыі.

Д. суднаходная — кароткі канал з адным ці некалькімі шлюзамі; робіцца для абходу парогаў, плацін. Д. энергетычная — абходныя тунелі, трубаправоды, каналы. Будуецца з нахілам значна меншым за нахіл ракі (каб атрымаць у канцы Д. напор вады, які выкарыстоўваецца ў дэрывацыйных ГЭС; гл. *Гідраэлектрычная станцыя*). Такая Д. бывае напорнай, калі паверхня вады непасрэдна не сутыкаецца з атмасферай (тунелі, трубаправоды), і безнапорнай (каналы).

2) У балістыцы — адхіленне артылерыйскага снарада (кулі) ад плоскасці стральбы; узнікае з прычыны іх вярчэння.

Літ.: Использование водной энергии, ч. 3, М.—Л., 1965; гл. таксама літ. пры арт. *Балістыка*.

ДЭ́РЫК, дэрык-кран (англ. derrick), грузападымальны стралавы кран з апорнай паваротнай мачтай, размацаванай падкосамі ці расцяжкамі (вантамі). Гл. *Кран падымальны*.

ДЭРЭ́ГУС Міхаіл Гардзеевіч [н. 22.11(5.12). 1904, сяло Вясёлае Харкаўскага пав.], украінскі савецкі графік і жывапісец. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (1958). Чл. КПСС з 1951. Вучыўся ў Харкаўскім маст. ін-це (1923—30). Работы ў графіцы: іл. да твораў Т. Шаўчэнкі («Кацярына», 1939, 1956), М. Гогаля («Вечары на хутары каля Дзіканькі», 1950, «Тарас Бульба», 1952, 1956), серыя «Украінскія нар. думы і гістарычныя песні» (1947—57) і інш.; у жывапісе: «Трыпольская трагедыя» (1935), «Пераяслаўская рада» (1952, з С. Рэпіным і В. Савенкавым), «Дума пра казака Галоту» (1960) і інш. Узнаг. ордэнам Леніна.

Літ.: Михаил Гордеевич Дерегус, М., 1954.

ДЭСА́НТ (франц. descente апускание, высадка), войскі, прызначаныя для высадкі або высаджаныя на занятую ворагам тэрыторыю для баявых дзеянняў. Паводле мэты, задач і складу войск бывае тактычны, аператыўны і стратэгічны, паводле спосабу дастаўкі — паветраны, марскі і камбінаваны.

ДЭ САНТЫС (De Santis) Джузепе (н. 11.2. 1917, г. Фонды), італьянскі кінарэжысёр. Адзін з заснавальнікаў *неарэалізму*. Чл. ІКП. У 1943—45 удзельнік Супраціўлення. Фільмы: «Трагічнае паляванне» (пастаўлены на сродкі Нац. асацыяцыі партызанаў Італіі, прэмія 8-га Міжнар. кінафестывалю ў Венецыі, 1947), «Горкі рыс» (1949), «Няма міру пад алівамі» (1950), «Рым, 11 гадзін» (1952), «Яны ішлі на ўсход» (1962—64, з сав. кінематаграфістамі) і інш.

Літ.: Кацев И. Джузеппе Де Сантис, М., 1965.

ДЭ СІКА (De Sica) Вітторыо (н. 7.7.1901, г. Сора), італьянскі акцёр і кінарэжысёр. Адзін з заснавальнікаў *неарэалізму*. З 1931 акцёр, з 1943 рэж. кіно. Фільмы: «Шуша» (1946), «Выкрадальнікі веласіпедаў» (1948, Вялікая прэмія 2-га Міжнар. кінафестывалю (Мкф) у Кноке-ле-Зут у Бельгіі і прэмія 4-га Мкф у Лакарна, 1949), «Цуд у Мілане» (1950, Вялікая прэмія 4-га Мкф у Кане, 1951), «Умберта Д.» (1951), «Дах» (прэмія 9-га Мкф у Кане, 1956), «Чачара» (1960), «Альтонскія вязні» (1962), «Бум» і «Учора, сёння, заўтра» (1963), «Сланечнікі» (1970) і інш.

Літ.: Богемский Г. Витторио Де Сика, М., 1963.

ДЭСКРЫПТЫЎНАЯ ЛІНГВІСТЫКА, гл. *Структурная лінгвістыка*.

ДЭСПАТЫЯ (грэч. despotéia неабмежаваная ўлада), форма праўлення ў большасці стараж. рабаўладальніцкіх дзяржаў Усходу (Егіпет, Асірыя, Вавілонія, Індыя, Кітай і інш.), пры якой неабмежаваная законам улада належыць аднаму ўладару, наследнаму манарху, які правіць з дапамогай ваенна-бюракратычнага апарату.

Д. папярэднічала ваен. дэмакратыя, часам разгалінаваная арыстакратычна-алігархія. Склалася ва ўмовах доўгага захавання абшчыннага побыту, калі яшчэ не было прыватнай уласнасці на зямлю. Феад. Д. найб. развілася ў Асманскай імперыі (14—16 ст.), у дзяржаве *Вялікіх Маголаў* (16—17 ст.), Іране (18 ст.).

ДЭТА́ЛІ МАШЫ́Н, асобныя часткі і найпрасцейшыя злучэнні іх у машынах, прыладах, прыстасаваннях, а таксама навук. дысцыпліна пра разлікі і канструяванне гэтых частак. Адрозніваюць Д. м. агульнага і спец. прызначэння.

Да Д. м. агульнага прызначэння належаць раздымныя (балтовыя, шпоначныя, шліцавыя, клінавыя, профільныя) і нераздымныя (аварныя, заклёпачныя, прэсавыя) злучэнні (гл. *Злучэнні ў машынабудаванні*), перадачы трэннем і счапленнем (гл. *Перадача ў машынабудаванні*), валы, падшыпнікі, муфты, спружыны і інш. Перадачы трэннем (фрыкцыйныя, раменныя) і счапленнем (зубчастыя, вінтавыя, чарвячныя, ланцуговыя) перадаюць магутнасць рухавіка рабочаму органу машыны. З'яўляючыся часткамі розных машын, Д. м. агульнага прызначэння аднаго віду выконваюць аднолькавыя функцыі. Д. м. спец. прызначэння (напр., шпіндэль, поршань) выкарыстоўваюцца толькі ў асобных відах машын. Задача навук. дысцыпліны пра дэталі машын — стварэнне тэарэтычна абгрунтаваных і практычна праверапых метадаў разліку і праектавання Д. м. Да іх адносяцца: выбар адпаведных матэрыялаў для вырабу дэталяў; наданне дэталям мэтазгодных формаў і памераў, якія забяспечваюць трываласць канструкцый пры мінімальным выдаткаванні матэрыялаў; вызначэнне ступені дакладнасці памераў, якасці рабочых паверхняў дэталяў; распрацоўка тэхн. умоў на выраб Д. м., каб забяспечыць іх тэхналагічнасць (зручней вырабляць, збіраць, змазваць дэталі і заменьваць іх пры рамонце). Курс «Д. м.» цесна звязаны з тэарэт. механікай, тэорыяй механізмаў і машын (гл. *Механізмаў і машын тэорыя*), курсам «Супраціўленне матэрыялаў», металазнаўствам, тэхналогіяй апрацоўкі металаў.

Літ.: Детали машин. Расчет и конструирование. Справочник, т. 1—3, 3 изд., М., 1968—69; Детали машин в примерах и задачах, под ред. С. М. Батшеева, Мн., 1970.

В. С. Мельнікаў. Мінск.

ДЭТАНАВА́ННЕ (ад франц. détonner фальшыва спяваць), пячыстае гучанне, адхіленне ад дакладнай вышыні гуку. Бывае пры спевах, ігры на інструментах са свабоднай інтанацыяй (струнных і духавых).


ДЭТАНА́ЦЫЯ, хуткі хімічны працэс, які суправаджаецца выдзяленнем цяпла і скорасць распаўсюджвання якога большая за скорасць гуку ў дадзеным рэчыве.

Пры Д. ўзнікае *ўдарная хваля*, што сціскае і награе рэчыва і стварае ўмовы для працякання хім. рэакцый, энергія якіх у сваю чаргу падтрымлівае ўдарную хвалю і забяспечвае пасталянства скорасці яе распаўсюджвання. Пры расшыранні сціснутых прадуктаў Д. ўзнікае *выбух*. Д., выкліканая ў сумесі газаў (знешнім ударам, эл. разрадам і інш.), спараджае ўдарную хвалю, якая падаграе газавую сумесь і абуджае працэс гарэння. Па-за ўдарнай хваляй узнікае нястойлівы фронт, у якім ёсць пульсоўныя неаднароднасці (т. зв. пульсоўная Д.). Калі неаднароднасці апісваюць кругі вакол восі, перпендыкулярнай да плоскасці фронту Д., то такая Д. наз. спінавай, а неаднароднасць — ядром спіну. У адрозненне ад газаў, дзе для кожнай выбуховай сумесі існуе характэрная скорасць Д., у цвёрдых і вадкіх *выбуховых рэчывах* (ВР) скорасць распаўсюджвання Д. залежыць ад шчыльнасці зараджання, дыяметра зарадаў і інш. умоў. Скорасць Д. у цвёрдых і вадкіх ВР значна большая за скорасць Д. ў газападобных, а часам перавышае 8 *км/сек* (гексаген — 8,82, ТЭН — 8,5 *км/сек*.). Выкарыстанне ВР і высокакалорыйнага ракетнага паліва, праблемы павышэння хуткі рухавікоў унутр. згарання і забеспячэння тэхнікі бяспекі ў шахтах і рудніках звязаны з заканамернасцямі працэсаў Д.

Літ.: Зельдович Я. Б. и Компанеец А. С. Теория детонации, М., 1955; Детонация взрывчатых веществ и безопасность взрывных работ, М., 1967; Щелкин К. И. Детонация, М., 1968; Детонация и двухфазное течение, пер. с англ., М., 1966.

І. С. Жыгуноў. Мінск.

ДЭТА́НДЭР (ад франц. détendre аслабляць), машына для халаджэння газу спосабам яго расшырэння з адначасовым выкананнем знешняй работы. Найб. халаджэнне газу адбываецца пры адыябатычным расшырэнні (гл. *Адыябатычны працэс*). Прадукцыйнасць Д. вызначаецца розпасцю значэнняў цеплаёмістасці газу да і пасля расшырэння.



Рэактыўна - радыяльны турбадэтандэр: *1* — лапаткі ротара; *2* — ротар; *3* — накіравальны сопласы; *4* — корпус; *5* — вал ротара.

Адрозніваюць Д. поршневыя і турбінныя (турбадэтандэры). Поршневы Д.— поршневая машына простага дзеяння, канструктыўна падобны да кампрэсара або паравой машыны; турбінны Д. (гл. рыс.) — актыўная ці рэактыўная турбіна. Кпдз поршневых Д. 0,6—0,7; турбадэтандэраў актыўнага тыпу 0,55—0,65, рэактыўнага тыпу 0,82—0,85. Выкарыстоўваюцца Д. ў прамысл. установах для атрымання азоту і кіслароду з паветра метадам глыбокага халаджэння, ва ўстаноўках для звадкавання азоту, кіслароду, гелію і інш. газаў в нізкай т-рай кіпення (гл. *Звадкаванне газаў*).

Літ.: Расширительные машины, М.— Л., 1966.

ДЭТРОЙТ (Detroit), горад на Пн ЗША ў штаце Мічыган. На беразе р. Дэтройт, на водным шляху па Вялікіх азёрах. Засн. ў 1701. Порт. Вузел чыг. і аўтамаб. дарог, аэрапорты. 4127 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1968). Цэнтр аўтамабілебудавання ЗША. У Д. праўленні і асн. з-ды найбольшых аўтамаб. манаполій

ЗША («Форд мотар», «Джэнерал мотарз» і «Крайслер»). Чорная і каляровая металургія, нафтаперапрацоўка. Ваенная, авіяцыйная, хім., гумавая, палігр., харч. прамысловасць. Вагона-, судна- і станкабудаванне. Ун-т. Музей аўтамабіляў.

ДЭТЭКТАР, 1) радыётэхнічны — прылада для пераўтварэння мадуляваных высокачастотных ваганняў у ваганні больш нізкай (гукавой) частаты. Пры дэтэктаванні ваганняў з амплітуднай мадуляцыяй ужываецца амплітудны Д. Пры частотнай ці фазавай мадуляцыі ваганні спачатку пераўтвараюцца ў ваганні мадуляваныя па амплітудзе з дапамогай частотнага ці фазавага Д., а потым дэтэктаванне робіцца амплітудным Д. Выкарыстоўваецца ў радыёпрыёмных прыладах. 2) Д. альфа-, бэта-, гамавыпрамяненняў — прылады для выяўлення гэтых выпрамяненняў. Складаюцца з адчувальнага элемента (*іанізацыйная камера*, лічыльнік Гейгера — Мюлера, сцынтыляцыйны лічыльнік і інш.), у якім пры ўзаемадзеянні радыеактыўнага выпрамянення з рэчывам узнікаюць эл. імпульсы, і з схемы рэгістрацыі гэтых імпульсаў. 3) Д. шчыльнасці нейтронаў — прылада для вызначэння ліку нейтронаў, якія падаюць на 1 *см*² за 1 *сек*. Мае адчувальны элемент (напр., борны лічыльнік), у якім нейтроны выклікаюць спецыфічныя ядз. рэакцыі. Зараджаныя прадукты рэакцый рэгіструюцца па эл. імпульсах, якія ўзнікаюць у матэрыяле Д. Лік імпульсаў прапарцыянальны шчыльнасці нейтронаў.

Літ.: Лобанов Н. Л. Детектирование радиосигналов, М., 1960; Пэюмов Н. М. Преобразование частоты, М.— Л., 1965; Калашникова В. И. и Козодаев М. С. Детекторы элементарных частиц, М., 1966.

ДЭТЭКТЫЎНАЯ ЛІТАРАТУРА (англ. detective шпік, лац. detectio раскрыццё), адзін з відаў авантурна-прыгодніцкай л-ры, які паказвае працэс раскрыцця цяжкіх злачынстваў і розных таямніц.

Першыя творы Д. л. напісалі Э. По («Забойства на вуліцы Морг», 1841; «Украдзены ліст», 1845) і У. Коліз («Месячны камень», 1868). Самыя яркія прыклады гэтай л-ры — апавяд. А. К. Дойла, Г. К. Чэстэртана, аповесці і раманы Ж. Сіменона. Пашыраная ў ЗША і інш. бурж. краінах Д. л., гераізуючы забойствы і злачынствы, абуджае ў чалавеку нізкія інстынкты, адмоўна ўплывае на моладзь. У сучаснай бурж. Д. л. самага рэакц. кірунку вылучаецца палітычны дэтэктыў антыкамуністычнага характару, які ўсталяваўся ў перыяд «халоднай вайны» і звязаны з імем Я. Флемінга, стваральніка вобраза Дж. Бонда. Найлепшыя творы сав. Д. л. (Л. Шэйніна, М. Томана і інш.), насычаныя рамантыкай пошукаў і подзвігаў, услаўляюць павагу да чалавека, розум і адвагу, адданасць радзіме і народу. У бел. л-ры элементы дэтэктыву ёсць у творах Э. Самуйлёнка («Тэорыя Каленбруна»), У. Караткевіча («Дзікае паляванне караля Стаха») і інш. *С. А. Андраюк.* Мінск.

ДЭТЭРМІНАВАНЫЯ І ІМАВЕРНАСНЫЯ АЎТАМАТЫ, абстрактныя мадэлі рэальных сістэм, у якіх перапрацоўка *інфармацыі* адбываецца дэтэрмінавана або імавернасна.

У дэтэрмінаваным аўтамаце (ДА) уваходны сігнал пераводзіць кожны стан (з усёй сукупнасці станаў) у цалкам вызначаны стан гэтай жа сукупнасці і выхадны сігнал. ДА пры пэўным пач. стане задае *аператар*, які адназначна ператварае любую канечную паслядоўнасць уваходных сігналаў у паслядоўнасць выхадных сігналаў. У імавернасным аўтамаце (ІА) уваходны сігнал можа перавесці кожны стан (з усёй сукупнасці станаў) у любы стан гэтай жа сукупнасці з пэўнай *імавернасцю*. Для ІА нельга дакладна сказаць, у якую выхадную паслядоўнасць сігналаў будзе ператворана дадзеная ўваходная паслядоўнасць. ІА выкарыстоўваюцца пры вывучэнні сістэм са складанымі паводзінамі (у біялогіі, псіхалогіі).

Літ.: Гл. пры арт. *Аўтаматаў тэорыя.*

А. Ш. Блох. Мінск.

ДЭТЭРМІНА́НТ (ад лац. determinans вызначальны), тое, што *вызначальнік*.

ДЭТЭРМІНІЗМ (ад лац. determinare вызначаць, абмяжоўваць), вучэнне пра ўсеагульную прычынную абумоўленасць прыродных, грамадскіх і псіхічных з'яў. У марксісцкай філасофіі Д.— канцэпцыя, якая ў процілеглась *індэтэрмінізму* сцвярджае універсальную дэтэрмінаванасць усяго існага: прыцыпова немагчымыя з'явы, якія знаходзяся б па-за ўсеабдымнай сістэмай сувязей. Развіццё ідзе такім чынам, што кожны ўзны стан матэрыяльнай сістэмы абумоўлены не станам у папярэдні момант часу і тэндэнцыямі ўнутранымі і вонкавымі сувязямі, у якіх ён знаходзілася. Канкрэтныя формы Д. неабходныя, разнастайныя: прычыннасць, сувязь станаў, законы рознай ступені агульнасці, узаемадзеянне, сувязі неабходныя і выпадковыя, дынамічныя і статыстычныя, унутраныя і вонкавыя, непасрэдныя і апасродкаваныя і інш. У гнасеалагічным аспекце Д.— сістэма метадалагічных сродкаў даследавання сусв. сувязі і навук. прадбачання.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, М., 1954; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); Ягоя. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (там жа, т. 29); Проблема причинности в современной физике, М., 1960; Бунге М. Причинность, пер. с англ., М., 1962.

А. У. Самусевіч. Мінск.

ДЭЎЛІНСКАЕ ПЕРАМІР'Е 1618, паміж Рудзяржавай і Рэччу Паспалітай. Заключана 1 снеж. ў с. Дэўліна каля Троіца-Сергіева манастыра (г. Загорск) на 14,5 года.

Расія згадзілася на перамір'е, каб атрымаць перадышку і сабраць сілы для барацьбы за страчаныя ў выніку 14-гадовай інтэрвенцыі землі. Рэч Паспалітая — з прычыны няўдалай спробы кароля Уладзіслава сесці на маскоўскі трон. Паводле Д. п. Расія мусіла ўступіць Рэчы Паспалітай смаленскія, чарнігаўскія і ноўгарад-северскія землі з 29 гарадамі. Адпаў і пасля Д. п. польскі прэтэндумешваўся ва ўнутр. справы Расіі, не прызнаваў Міхаіла Раманава царом, а адзінай кандыдатурай на маск. трон лічыў каралевіча Уладзіслава. Цяжкія ўмовы Д. п. ліквідаваны ў выніку руска-польскай вайны 1632—34, руска-польскай вайны 1654—67 (гл. *Палянаўскі мір 1634*, *Андрусаўскае перамір'е 1667* і *«Вечны мір» 1686*).

Літ.: Савич А. А. Деулинское перемирие 1618 г., «Ученые записки Московского гос. педагогического ин-та им. К. Либкнехта. Сер. историческая», 1939, в. 2.

Л. М. Лыч. Мінск.

ДЭ-ФА́КТА (лац. de facto фактычна), у міжнар. праве прызнанне якой-н. дзяржавай ці ўрада ў якасці фактычна дзейных (без устанаўлення з імі афіцыйных дыпламатычных зносін (параўн. *дэ-юрэ*).

ДЭФАЛІЯ́НТЫ (*дэ...*+лац. folium ліст), ручнымі, якія выклікаюць ападанне лісця. Да іх належаць сінтэтычныя арган. і мінер. злучэнні (хларат магнію, цыянамід кальцыю, хларат-хларыд кальцыю, эндатал, раданісты натрый, далапон і інш.) і некат. прыродныя рэчывы (этылен, абсцызінавая к-та).

Ад дзеяння Д. на расліны парушаецца абмен рачываў, паскараецца ўтварэнне аддзялляльнага слоя ў аснове чаранка, лісце галадае, паволі адмірае і адпадае (штучны лістапад). Многія Д. (хларат магнію, хларат-хларыд кальцыю), выкарыстаныя ў вялікіх дозах, сушаць расліны. Такія Д. называюць дэсікантамі (англ. desiccate сушыць). Д. і дэсіканты выкарыстоўваюцца для аднаразовай перад уборкай бавоўніку, насення лубіну (паскараецца выспяванне каробачак і насення, палягчаецца механізаваная уборка ўраджаю). У БССР насенны лубін апрацоўваюць пераважна раданістым натрыем.

Літ.: Стопов Л. Д. Дефолианты и десиканты, М., 1961; Бокарев К. С. Дефолианты и десиканты растений, М., 1965; Маштаков С. М., Деева В. П. и Волынец А. П. Физиологическое действие гербицидов на сорта культурных растений, Мн., 1967; Шутов Г. К. Эффективные приемы, ускоряющие созревание зернобобовых, Мн., 1965.

А. П. Валынец. Мінск.

ДЭФАРМА́ЦЫЯ, змена намераў ці формы цела, абумоўленая адносным перамяшчэннем яго частак. Узнікае пры мех. узаемадзеянні целаў, пад уплывам інерцыйных і гравітацыйных сіл, эл. і магн. палёў, пры змене тэмпературы.

Адрозніваюць агульную Д. цела ў цэлым (напр., абсалютнае падаўжэнне, вугал закручвання, прагіб) і лакальную (мясцовую) Д. Лакальная ў кожным элементарным аб'ёме цела апісваецца тэнзарам Д. Для кожнага элементарнага аб'ёму ў дэфармаваным целе існуюць такія тры ўзаемна перпендыкулярныя кірункі, што Д. ў ім можа быць выражана як налажэнне толькі *расцяжэнняў і сціскненняў* уздоўж гэтых кірункаў. Д. можа быць пругкай (Д. знікае пасля ліквідацыі прычыны, якая яе выклікала) і пластычнай (Д. пасля ліквідацыі прычыны астаецца). Д. заўсёды звязана з затратай энергіі, якая пры пругкай Д. пераходзіць у патэнцыяльную, а пры пластычнай — у цеплыню. Калі лакальная Д. дасягае граніцнага для дадзенага матэрыялу значэння, настае разбурэнне. Пластычная Д. звязана з рухам *дыслакацый*. Пругкія Д. вывучаюцца тэорыяй пругкасці, пластычныя — тэорыяй пластычнасці і паўзучасці. Найб. агульныя пытанні Д. рэальных цвёрдых і вадкіх целаў вывучае *рэалогія*. Пластычная Д. шырока выкарыстоўваецца ў тэхналогіі вырабаў з металаў і пластмас (штампоўка, коўка, пракатка, прасаванне, валачэнне). Гл. таксама *Гука закон*, *Зрух*, *Апрацоўка металаў ціскам*.

Літ.: Безухов Н. И. Основы теории упругости, пластичности и ползучести, М., 1968; Надаи А. Пластичность и разрушение твердых тел, т. 1—2, пер. с англ., М., 1954—69; Рейнер М. Деформация и течение, пер. с англ., М., 1963.

Г. К. Татур. Мінск.

ДЭФЕ́КТ МАСЫ (упаковачны эфект), памяншэнне масы пры злучэнні свабодных элементарных часцінак (пратонаў, нейтронаў і інш.) у адзіную сістэму (напр., *ядро атамнае*). Пры гэтым маса не знікае, а забіраецца выпрамяненнем. Гл. таксама *Ядзерная энергія*.

ДЭФЕКТАЛО́ГІЯ (лац. defectus недахоп+ +*...логія*), навука, якая вывучае заканамернасці развіцця, выхавання і навучання анамальных дзяцей (дзяцей з фізічнымі і псіхічнымі недахопамі). Распрацоўвае навукова абгрунтаваныя шляхі кампенсацыі фіз. і разумовых дэфектаў дзіцяці, навучання і прыстасавання яго да аб'ектыўных умоў жыцця, далучэння да грамадскага жыцця і практ. дзейнасці.


Як самастойная галіна навукі Д. склалася ў пач. 19 ст. Сав. Д. развівалася ў барацьбе з бурж. ідэалістычнымі, антынавук. тэорыямі, якія адмаўляюць магчымасць развіцця анамальных дзяцей і асн. задачай іх навучання лічаць прыстасаванне да элементарнай фіз. працы. Сав. Д. шырока выкарыстоўвае дасягненні фізіялогіі, псіхалогіі, медыцыны, мовазнаўства, радыёэлектронікі і інш. Састаўныя часткі Д.— *сурдапедагогіка* (вывучае закананамернасці выхавання і навучання дзяцей з недахопамі слыху), *тыфлапедагогіка* (займаецца пытаннямі выхавання і навучання дзяцей з дрэнным зрокам і слепых), *алігафрэнапедагогіка* (навука пра выхаванне, навучанне і шляхі карэкцыі недахопаў развіцця разумова адсталых дзяцей), *лагапедыя* (вывучае парушэнні мовы, шляхі іх пераадолення і папярэджання). У асобныя раздзелы Д. выдзяляюцца пытанні выхавання і навучання дзяцей з складанымі дэфектамі (слепата і глухата, разумовая адсталасць і глухата, і інш.), а рухальнымі парушэннямі і з парушэннямі эмацыянальна-валявой сферы (псіхапаты). Для дзяцей з фіз. і псіхічнымі недахопамі ў СССР створаны спец. школы. У БССР праблемы Д. распрацоўваюцца НДІ педагогікі Мін-ва асветы БССР, кафедрай дэфекталогіі ф-та пач. класаў Мінскага пед. ін-та імя М. Горкага. Бел. вучоныя вядуць даследаванні па вывучэнні псіхалагічных асаблівасцей анамальных дзяцей, па вызначэнні шляхоў удасканальвання навуч. працэсу ў спец. школах. У СССР выдаецца час. «Дефектология» (з 1969).

Літ.: Основы обучения и воспитания аномальных детей, М., 1965; Принципы отбора детей во вспомогательные школы, М., 1960; Дьячков А. И. Воспитание и обучение глухонемых детей, М., 1957; Основы специального обучения слабослышащих детей, М., 1968; Основы теории и практики логопедии, М., 1968; Земцова М. И. Пути компенсации слепоты в процессе познавательной и трудовой деятельности, М., 1956; Граборов А. Н. Очерки по олигофренопедагогике, М., 1961; Рубинштейн С. Я. Психология умственно отсталого школьника, М., 1970.

Т. Л. Ляшчынская. Мінск.

ДЭФЕКТАСКАПІЯ (ад лац. defectus загана+грэч. skopéō гляджу), сукупнасць фізічных метадаў выяўлення дэфектаў мікраструктуры ці хім. саставу, трэшчын, унутраных ракавін, неправараў аварных швоў і інш. парушэнняў суцэльнасці і аднароднасці матэрыялаў. Найб. пашыраныя метады Д.: магнітны, рэнтгенаўскі, гама-прамяневы, ультрагукавы, люмінесцэнтны.

Магн. метадам знаходзяць дэфекты ў вырабах з ферамагн. матэрыялаў (пераважна з сталяў). Пры намагнічванні дэфекты ўтвараюць патокі рассейвання, канфігурацыя якіх вызначаецца спосабам магн. парашку ці індукцыйным спосабам (гл. *Электрамагнітная індукцыя*). Дэфекты аварных швоў вызначаюцца магнітаграфічным спосабам, пры ім рассеяны магн. паток «запісваецца» на феромагн. стужку. Рэнтгенаўская Д. грунтуецца на тым, што розныя рэчывы па-рознаму паглынаюць рэнтгенаўскія прамяні. Існуюць фатаграфічны, візуальны, іанізацыйны і флуараграфічны спосабы рэнтгенаўскай Д. Найб. пашыраны фатаграфічны: рэнтгенаўскія прамяні ідуць праз выраб, які даследуецца, на рэнтгенаўскую плёнку. Пры візуальным спосабе ўжываецца тая ж схема, толькі плёнку заменьваюць рэнтгенаўскім экранам, на якім э'ялюмінесцуе адпаведнае адлюстраванне. Пры іанізацыйным спосабе карыстаюцца іанізацыйнай камерай, якая вымярае інтэнсіўнасць пройдзенага праз выраб выпрамянення. Флуараграфічным спосабам атрымліваюць паменшаны ценявы адбітак вырабу на экране, які флуарэсцыруе. З дапамогай рэнтгенаўскай Д. кантралююць вырабы з матэрыялаў, што прасвечваюцца рэнтгенаўскімі прамянямі (напр., з алюмінію, сталі, медзі; гл. таксама



Магнітаграфічны дэфектаскоп СМД-5, створаны Аддзелам фізікі нераабуральнага кантролю АН БССР.


Рэнтгенатэхніка). Метад гама-дэфектаскапіі падобны да рэнтгенаўскага, але выкарыстоўваюцца гама-прамяні (гл. *Гама-выпрамяненне*). Перавагі гама-Д. перад рэнтгенаўскай — монахраматычнасць выпрамянення, нескладанасць і партатыўнасць апаратуры (гл. таксама *Гама-прылады*). Ультрагукавая Д. заснавана на выкарыстанні з'явы адбіцця ультрагукавых хваляў ад мяжы падзелу двух асяроддзяў. Ажыццяўляецца з дапамогаю ультрагукавога дэфектаскопа, які складаецца з генератара эл. ваганняў, п'езаэлектрычных выпрамяняльніка і прыёмніка, індыкатара. Ультрагукавая Д.— самы дасканалы метад выяўлення заган у вырабах: можна кантраляваць вырабы вял. таўшчыні (да 10 *м*) і выяўляць вельмі дробныя дэфекты (памерам да 10^{-6} *мм*) (гл. таксама *Ультрагукавая тэхніка*). Люмінесцэнтным метадам выяўляюць паверхневыя і скразныя дэфекты ў вырабах з каляровых металаў і сплаваў, пластмас, керамікі з дапамогаю раствору фталюмінафору, які пранікае ў трэшчыны, поры і ў інш. дэфекты вырабу.

У БССР работы па развіцці тэарэт. асноў магнітаграфічнага метаду кантролю і выкарыстанні яго ў прамысл. вядуцца Аддзелам фізікі неразбуральнага кантролю АН БССР.

Літ.: Исследования по физике металлов и неразрушающим методам контроля, Мн., 1968; Козлов В. С. Физика магнитографической дефектоскопии, Мн., 1968; Соколов В. С. Дефектоскопия материалов, 2 изд., М.—Л., 1961; Дорофеев А. Л. Электроиндуктивная (индукционная) дефектоскопия, М., 1967; Ермолов И. Н. Физические основы эхо- и теневого методов ультразвуковой дефектоскопии, М., 1970; Румянцев С. В. Радиационная дефектоскопия, М., 1968; Воровиков А. С. Капиллярные методы дефектоскопии, М., 1968. *А. А. Жалнярові́ч.* Мінск.

ДЭФЕНЗІВА, назва органаў контрразведкі ў бурж. Польшчы (1918—39), а таксама паліт. паліцыі, якая вяла барацьбу з рэвалюц. рухам у Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне.

ДЭФІБРО́Р (франц. défibreur ад *dé*...+fibra валакно), машына для выпрацоўкі драўнінай масы сціраннем драўніны на вярчальным камені.



Кольцавы дэфіброр: *1* — камень; *2* — насычны апарат; *3* — прывод кольца; *4* — кольца для падачы драўніны; *5* — вадзяныя апырскавальнікі; *6* — загрузачная камера.

Паводле канструкцыі механізма прыціскання драўніны да каменя адрозніваюць Д. кольцавыя (гл. рыс.), ланцуговыя, вінтавыя, прэсавыя (гідраўлічныя). Д. маюць апырскавальнае прыстасаванне для ахаладжэння каменя, ванну для аддзялення драўнінай масы ад паверхні каменя, прыстасаванне, якім аўтаматычна рэгулюецца прыціскание драўніны да каменя, аўтам. рэгістратар і рэгулятар т-ры вады ў ванне і інш. У сучасных Д. выкарыстоўваюцца пераважна штучныя (кварцава-цэментавыя) камяні, акружная скорасць якіх да 27 *м/сек*. Прадукцыйнасць Д. 17—50 *т* паветранасухой драўнінай масы за суткі. Ужываюцца пераважна ў папяровай прамысловасці.

Літ.: Третьякова С. И. и Смирнов М. Н. Пособие дефибрерщику, М., 1969.

ДЭФІБРЫЛЯЦЫЯ СЭРЦА, частка комплекснага метаду *ажыўлення арганізма*.

ДЭ ФІЛІПА (De Filippo) Эдуарда (н. 24.5. 1900, Неапаль), італьянскі драматург, акцёр, рэжысёр тэатра і кіно. Выступаў у трупе Э. Скарпеты і інш. У 1931 і 1953 арганізоўваў уласныя трупы. У 1962 гастраляваў у СССР. Мастацтва Дэ Ф. спалучае прынцыпы нар. дыялектальнага і сучаснага т-ра Неапаля. Аўтар камедый аб прац. жыцці простых людзей Італіі: «Філумена Мартурана» (1946), «Мана на доўгіх нагах» (1948), «Мая сям'я» (1955), «Дэ Прэторэ Вінчэнца» (1957), «Субота, пядзеля, панядзелак» (1960), «Мэр раёна Саніта» (1961) і інш. Лепшы фільм Дэ Ф. «Неапаль — горад мільянераў» (1950).

Літ.: Молодцова М. Эдуардо де Филиппо, Л.— М., 1965.


ДЭФІНІЦЫЯ, гл. *Вызначэнне*.

ДЭФІЦЫ́Т (ад лац. deficit не хапае), 1) перавышэнне расходаў над даходамі. Адрозніваюць касавы Д.— нястача грошай у касе для бягучых плацяжоў, фінансавы — страты, выяўленыя пры падвядзенні вынікаў гасп. дзейнасці прадпрыемства, дзяржаўны (бюджэтны) — перавышэнне расходаў дзярж. бюджэту над даходамі. 2) Недахоп чаго-н. у парэшце ў патрэбаю ў ім.

ДЭФЛЯЦЫЯ (познелац. deflatio выдзіманне) у геалогіі — разбуральная дзейнасць ветру, выдзіманне і перанос прадуктаў выветрывання горных парод і глебаў. Адбываецца ў розных кліматычных раёнах, найб. інтэнсіўна ў пустынях, дзе пясок і пыл разносяцца ветрам на адлегласць да 3000 *км*. На Беларусі працэсы Д. ёсць на незамацаваных зандравых пясках па Палессі. Пры пераносе дробныя часцінкі парод абціраюць, шліфуюць і свідруюць паверхню горных парод (гл. *Карозія*) і самі абточваюцца. Гл. таксама *Эолавыя адклады*.

ДЭФЛЯЦЫЯ (у эканоміцы), у капіталіст. краінах змяншэнне колькасці папяровых грошай і неразменených на золата банкнот, выпушчаных у перыяд інфляцыі. Звычайна папярэднічае грашовай рэформе, суправаджаецца павелічэннем падаткаў на прадукты, скарачэннем крэдытаў прамысл. і гандлю, памяншэннем асігнаванняў на сац.-культ. патрэбы.

ДЭФО (Defoe) Даніэль (канец 1659 ці пач. 1660, г. Крыплгейт каля Лондана — 26.4.1731), англійскі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў бурж. рэаліст. рамана. Сын гандляра. Займаўся камерцыяй. З 1697 выступаў як журналіст. У публіцыст. творах сцвярджаў новыя бурж. адносіны, выкрываў заганы даўняга бурж. грамадства (трактаты «Вараска-арыстакр. грамадства (трактаты «Вараска-арыстакр. грамадства (трактаты «Вараска-арыстакр



Е, шостая літара беларускага алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай **є** («есть»), утворанай на аснове візант. «эпсілона» (ε). У старабел. пісьменнасці мела варыянты Е, є, ѥ, якія намагаюць палеографам вызначыць, калі напісаны помнікі, і лічбавае значэнне 5. Абазначае нелабіялізаваны галосны «э» пярэдняга раду сярэдняга пад'ёму і мяккасць папярэдняга зычнага («глеба — гл'эба»), а ў пачатку слова, пасля галосных, «ў», «ь» і апострафа — 2 гукі («й» і «э»): «ежа» («йэжа»), «свае» («свайэ»), «саўе» («саўйэ»), «лье» («л'йэ»), «аб'езд» («аб'йэздз»).

ЕВА (стараж.-яўр. Хава), паводле біблейскай легенды першая жанчына на свеце, жонка *Адама*, якую бог стварыў з яго рабра. Біблія сцвярджае, што Е. першая парушыла забарону бога і паспытала плод з «дрэва пазнання дабра і зла». Міфам пра паходжанне і грэхападзенне Е. царква апраўдвала бясправ'е становішча жанчыны ў класавым грамадстве.

ЕВАНГЕЛІЧНАЯ ЦАРКВА, аб'яднанні розных пратэстанцкіх цэркваў, у якіх галоўную ролю адыгрывае *лютэранства*.

ЕВАНГЕЛІЯ (ад грэч. euaggélion добрая вестка), раннехрысціянскія творы, у якіх апісваецца зямное жыццё Ісуса *Хрыста* і даюцца асноўныя догматы хрысціянства.


Вядомыя назвы прыкладна 30 Е. У канцы 4 ст., калі хрысціянства стала пануючай рэлігіяй, царква прызнала «боганатхнёнымі» і уключыла ў кананічны Новы запавет (гл. *Біблія*) чатыры з іх (ад Матфея, Марка, Лукі, Іаана), а астатнія абвясціла несапраўднымі (апакрыфічнымі). Гал. крыніца евангельскага апісання жыцця Хрыста — старазапаветныя прароцтвы пра месію. Е. расказваюць пра цудоўнае нараджэнне, цудатворнасць, пакутлівую смерць і ўваскрэсенне Хрыста. У апісанні гэтага і ў выкладанні сутнасці хрысц. вучэння паміж Е. і нават унутры іх многа супярэчнасцей. Вучоныя выкрылі ў іх шмат недарэчнасцей, гістар. і геагр. памылак і анахранізмаў. Е. напісаны на грэч., а не на арамейскай мове, якою карысталася насельніцтва Палесціны. Яны паўтараюць міфы стараж. рэлігій пра багоў.

Е. прапаведуюць непраціўленне злу, пакорлівасць лёсу, абагаўляюць зямныя пакуты, абяцаюць збавенне ад іх у замагільным царстве. Гэтыя ідэі пастаянна былі сродкам духоўнага заняволення працоўных, у капіталіст. краінах перашкаджалі і перашкаджаюць ім змагацца супраць эксплуататараў.

Літ.: Энгельс Ф. К истории первоначального христианства, Маркс К. и Энгельс Ф. Соч., т. 22; Крывелев И. А. Евангельские сказания и их смысл, М., 1959; Лившиц Г. М. Происхождение христианства в свете рукописей Мертвого моря, Мн., 1967; Свенцицкая И. С. Запрещенные евангелия, М., 1965; Ленцман Я. А. Сравнивая евангелия, М., 1967. *Г. А. Марцінковіч.*

ЕГІПЕТ Старажытны, ранняя рабаўладальніцкая дзяржава ў ніжнім цячэнні Ніла ў Паўн.-Усх. Афрыцы.

Гістарычны нарыс. Пасяленні на тэр. Е. вядомыя з эпохі палеаліту. У 10—6-м тысячагоддзях да н. э. вандроўныя плямёны, як мяркуюць, протасеміты, берберы, кушыты і інш. жылі ў стэпі ўздоўж Ніла, дэльта і даліна якога былі часткова забалочаны. Змена клімату ў эпоху неаліту выкліла іх перасяленцца ў пойму Ніла. У 4-м тысячагоддзі да н. э. на базе змяшання гэтых плямёнаў склаўся егіп. народ. Для асушэння зямель стараліся каналы і дамбы. Пачалі ўжывацца плуг, метал. прылады працы. Развіццё прадукцыйных сіл, выкарыстанне рабскай працы вяло да расслаення абшчыны, вылучэння родавай знаці, спрыяла ператварэнню правадыроў плямёнаў у царкоў. Узніклі прымітыўныя дзярж. ўтварэнні, ад якіх найшлі пазней адм. акругі, т. зв. номы. Каля сярэдзіны 4-га тысячагоддзя да н. э. узніклі два царствы: на Пн — Ніжні Е., на Пд — Верхні Е. Мэтавуюць, што канчаткова аб'яднаў краіну каля 3000 да н. э. цар Верхняга Е. Менес, які захапіў Ніжні Е. і заснаваў крэпасць Мемфіс (з 28 ст. да н. э. сталіца Е.). Е. стаў цэнтралізаванай усх. дэспатыяй, якая забяспечвала стварэнне агульнай для ўсёй дзяржавы сістэмы ірыгацыйных збудаванняў. Улада цара (фараона) была неабмежаваная. У пэрыяд т. зв. Ранняга царства (каля 3000—каля 2800 да н. э.) развівалася ірыгацыйная гаспадарка, удасканальваліся каменныя і медныя прылады працы, паявіўся ганчарны круг, пашырыўся меновы гандаль. Фарміраваўся дзярж. апарат, вылучыліся адм. акругі — номы на чале з намархамі. Вяліся войны з кушытамі (нубійцамі) на Пд, ліівійцамі на ПнЗ, бедуінамі Сінайскага п-ва. У перыяд Стараж. царства (каля 2800 — каля 2250 да н. э.) пабач з абшчыннымі узнікла прыватнае землеўладанне, умацаваўся бюракр. апарат, паявілася сталыняе войска. Неабмежаванай улада фараонаў адлюстравалася ў будаўніцтве пахавальна-шыкоўных помнікаў (пірамід (Хеопса, Хефрэна і інш.). У 23—21 ст. да н. э. Е. распаўся на шэраг номаў і дробных дзяржаў. На Пн узвысіліся намархі Гераклеопаля, на Пд — Фіваў. Раздробленасць адмоўна адбілася на гаспадарцы Е. Каля 2050 да н. э. Е. зноў аб'яднаны пад гегемоніяй Фіваў. У перыяд Сярэдняга царства (каля 2050 — каля 1700 да н. э.) вялося ірыгацыйныя работы ў Фаюмскім аазісе. Паявіліся рабы з бронзы, быў удасканалены плуг. Паявіліся калясніцы, конніца, пашырыліся металічныя зброя і даспехі. Развівалася гандл. абмен. Пры Аменемхеце III (2-я пал. 19 ст. да н. э.) умацавалася цэнтр. ўлада. Узмоцненая эксплуатацыя нар. мас, унутраныя супярэчнасці выклікалі вялікае нар. паўстанне (каля 1750 да н. э.). І новы распад краіны. Каля 1700 да н. э. ў Е. уварваліся плямёны гіксосаў, якія захапілі большую частку краіны (амаль на 110 гадоў). Заснавальнік 18-й дынастыі Яхмас I (каля 1580—59 да н. э.) у 1580 вызваліў Е. ад гіксосаў. Яго панаванне пачынае перыяд Новага царства (каля 1580—каля 1070 да н. э.). Паявіліся першыя вырабы з жалеза, пашыралася ўжыванне бронзы, выраб шкла, удасканальвалася тэхніка апрацоўкі металаў, пачалі шырока ўжывацца павозкі на колах. Расквітнела прыватнае рабаўладальніцтва. Пры Тутмосе I (1538—1525 да н. э.), Тутмосе III (1503—1491 да н. э.) і Аменхатэпе II (1491—1465 да н. э.) да Е. далучаны Сірыя, Палесціна, Куш (да 4-га парога Ніла). Е. меў рэгулярныя дыпламат. і гандл. сувязі з дзяржавамі Мітані, Вавілоніяй, Хецкім царствам і інш. Найвышэйшага росквіту дасягнуў пры Аменхатэпе III (1455—1419 да н. э.). Фараон *Аменхатэп IV* вёў барацьбу са жрэцтвам, якое мела вял. зямельныя ўладанні, шмат рабоў, золата. У час праўлення Рамсеса II (1317—1251 да н. э.) Е. ваяваў з хетамі за Сірыю. Доўгія войны, велізарныя ахвяраванні храмам, будаўніцтва палацаў, свяцілішчаў прывялі да эканам. і паліт. аслаблення Е. Позні перыяд (11—4 ст. да н. э.) пачаўся фактычным распадам Е. У 2-й пал. 8 ст. да н. э. папаў пад уладу Куша. У 671 да н. э. заваяваны асірыйцамі, вызвалены ў час праўлення Псаметыха I (663—610 да н. э.). З 525 да н. э. пад уладай персаў. Грэка-рымскі перыяд (332 да н. э.—395 н. э.) пачаўся з заваявання Е. Аляксандрам Македонскім. Засн. ў Е. Александрыя стала найбуйнейшым гандл. і культ. цэнтрам эліністычнага свету. З 305 да 30 да н. э. ў складзе дзяржавы *Пталамеяў*. У 30 да н. э. стаў рымскай правінцыяй. Пасля падзелу Рымскай імперыі ў 395 правінцыя Усх. Рымскай імперыі. У 636 заваяваны арабамі.



Літаратура. Л-ра Е. існавала на егіп. мове, якая выйшла з ужытку ў першыя стагоддзі н. э. Творы, звычайна ананімныя, збіраліся ў выглядзе іерагліфічных, іератычных і дэматычных тэкстаў.

Перыяды: л-ра Стараж. царства, Сярэдняга царства і Новага царства. Ад пераходных перыядаў — паміж Стараж. і Сярэднім і паміж Сярэднім і Новым царствамі — літ. помнікаў амаль не захавалася. Апошні этап развіцця л-ры Е.— л-ра, напісаная складаным дэматычным пісьмом. Асн. жанры: фантаст. казкі, празаічныя творы гістор.-рэаліст. характару, любоўная лірыка, байкі, т. зв. павучанні. Да помнікаў л-ры Е. адносяць таксама тэксты пірамід, надпісы цароў і вяльможаў, якія маюць літ. вартасць. Многія сюжэты фальклору і л-ры сучасных і стараж. народаў свету ўпершыню сустракаюцца ў л-ры Е.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва. У даліне Ніла ў 5—4-м тысячагоддзях да н. э. склалася адна з найбольш стараж. у свеце культур. У Е. ўзніклі многія класічныя формы архітэктуры, створаны высокамаст. насценныя рэльефы і роспісы, развіўся скульптурны партрэт.












У часы энеаліту паявіліся прамавугольныя ў плане хаціны з сырцовай цэглы. У перыяд Ранняга царства складваюцца характэрныя рысы старажытнаегіп. мастацтва — манументальнасць, строгая прастата і абагульненасць формаў, сіметрыя і статыка. Пахавальні знаці і фараонаў будаваліся ў выглядзе паралелепіпеда з нахіленымі бакамі над пахавальнай камерай (т. зв. «мастаба»). Сцены «мастабаў» укрываліся рэльефамі і роспісамі з карцінамі жыцця ў царстве мёртвых, сцэнамі паляванняў, святаў, паляўых работ. Выявы на плітах размяшчаліся радамі, кампазіцыя была рытмічная, фігура фараона вылучалася сваім памерам. У перыяд Стараж. царства пахавальнямі фараонаў сталі служыць вялізныя *піраміды*. Класічны тып егіп. піраміды — комплекс у Эль-Гізе: піраміды фараонаў Хеопса, Хефрэна і Мікерына. Побач з імі 6-метровая высечаная з скалы фігура сфінкса з партрэтнай галавой фараона Хефрэна. Высокага ўзроўню дасягнула мастацтва скульптурнага партрэта (статуі фараона Хефрэна, жраца Ранафера, жраца Каі і інш.). Рэльефам і роспісам Стараж. царства ўласцівы пачуццё рытму, прыгажосць контурнай лініі, колеравай плямы. Вывявы строга плоскасныя. Фігура звычайна паказана ў фас, галава і ногі — у профіль. У эпоху Сярэдняга царства архітэктура траціць былую грандыёзнасць. Будуюцца і развіваюцца гарады (Кахун і інш.). Рэльефы і роспісы гэтага часу маюць больш свабодную кампазіцыю, перадачу руху, асабліва ў паказе бытавых сцэн. Паўтычнасцю і непасрэднасцю вызначаюцца выявы птушак і жывёл у роспісах пахавальняў у Бені-Хасане (20 ст. да н. э.). У часы Новага царства ўзмацняецца цяга да пышнасці і дэкар. багацця. Стварэюцца грандыёзныя храмавыя комплексы Луксар і Карнак у Фівах. Храмы складаліся з двухвежавага ўваходу — пілона, адкрытага, паўпёмнага двара, абнесенага каланадай, шматкалоннай гіпастыльнай залы і свяцілішча. Да храма вяла алея сфінксаў. Каля пілона скальнага храма Абу-Сімбел сталі каласальныя статуі фараона (20 м вышыні). Асабліваго росквіту дасягнула мастацтва Е. ў т. зв. перыяд Амарны (пач. 14 ст. да н. э.), калі Аменхатэп IV (Эхнатон) пабудаваў новую сталіцу Е.— Ахетатон (г. Эль-Амарна). Рэльефам, роспісам, статуям гэтага часу, асабліва партрэтам фараона і царыцы Неферціці, уласцівыя тонкасць перадачы індывідуальных рысаў, строгая прыгажосць лініі і дасканалець формаў. На высокім узроўні былі і маст. рамёствы, пра гэта сведчаць знаходкі ў пахавальні Тутанхамона ў Бібан-эль-Малуку (14 ст. да н. э.). У перыяд Саіскай дынастыі (7 ст. да н. э.) мастацтву Е. было ўласцівае эклектычнае перайманне стараж. узораў. Арыгінальнае спалучэнне егіп. і ант. традыцый характэрнае мастацтву Е. пасля заваёў Аляксандра Македонскага. У архітэктуры гэта найб. выявілася ў буд-ве г. Александрыі, у выяўл. мастацтве — у *фаюмскіх партрэтах*. Пасля таго, як Е. увайшоў у склад Візантыі (4 ст.), тут склалася копцкае мастацтва. Егіпцяне-хрысціяне (т. зв. копты) будавалі шматлікія манастыры і цэрквы. У выяўл. мастацтве былі пашраны роспісы і рэльефы на хрысц. тэмы, важная галіна копцкага мастацтва — выраб тканін. Іл. гл. на ўкл. да гэтага арт. і да арт. *Архітэктура*.

Музыка. Сярод стараж. дзяржаў Б. Усходу Е. меў найб. развітае муз. мастацтва.

Музыка суправаджала масавыя святкаванні, рэліг. абрады, прац. працэсы. Яна была пераважна аднагалосая і мела сінкрэтычны характар, г. зн. была неаддзельная ад інш. відаў мастацтваў — танца, пантамімы, драм. паказаў, л-ры. Паралельна расслаенню грамадства на класы ішоў падзел музыкі на культавую, прыдворную і народную. Паступова ўскладняюцца формы выканальніцтва (з'яўляюцца ансамблі), нараджаецца мастацтва хейраноміі (правобраз дырыжыравання). У эпоху Новага царства ўзнікаюць прымітыўныя формы шматгалосся. У муз. інструментарыі Е. ліры, арфы, лютні, падоўжныя і папярочныя флейты, падвойныя габоі, барабаны, сістры і інш. Муз. культура Е. вызнала пэўны ўплыў суседніх народаў.

Літ.: Струве В. В. История Древнего Востока, 2 изд., Л., 1941; Тураев Б. А. Древний Египет, П., 1922; Яго ж. История Древнего Востока, т. 1—2, Л., 1935; Брестед Д. Г. История Египта с древнейших времен до персидского завоевания, пер. с нем., т. 1—2, М., 1915; Тураев Б. А. Египетская литература, т. 1, М., 1920; Коростовцев М. А. Писцы Древнего Египта, М., 1962; Лирика Древнего Египта, [пер. з егіп.], М., 1965; Матье М. Э. Искусство Древнего Египта, М., 1970. *І. С. Кацнельсон* (гісторыя), *Т. М. Любімава* (літаратура), *С. І. Хаджаш* (архітэктура, выяўл. мастацтва). Масква; *Г. С. Глушчанка* (музыка). Мінск.

ЕГІПЕЦКАЕ ПІСЬМО, адна з старажытных сістэм пісьма, самыя даўнія помнікі якога датуюцца 32 ст. да н. э. Мела тры разнавіднасці: іерогліфіка, іератыка і дэмотыка.

Іерагліфічнае пісьмо 30-18 ст. да н.э.	Іератычнае пісьмо 13-2 ст. да н.э.	Дэматычнае пісьмо 4-1 ст. да н.э.	Гучанне	Значэнне
			ḥ-r-w	пчалаед
			r-m	рыба
			ḏ-t	змяя
			m-ś	веер
			š-z	паводка

Пачатковы этап Е. п.— малюнкавая ідэаграфія (гл. *Ідэаграфічнае пісьмо*), якая развілася з піктаграфіі. Кожны малюнак абазначаў канкрэтны прадмет, з часам малюнкі сталі набываць пэўную сімволіку (напр., малюнак пчалы стаў абазначаць не толькі пчалу, а і занятак, стараннасць, працавітасць). Большасць іерогліфаў маглі мець гукавое значэнне: абазначалі спалучэнне 2 і больш вычных гукаў або асобны гук (усяго 24). Галосныя гукі ў іерагліфічным пісьме не абазначаліся. Фанаграмы ў ім пераважалі над ідэаграмамі. Іерогліфаў, што найчасцей ужываліся, было каля 700. Выкарыстанне папірусу і трысняговай палачкі выклікала выпрацоўку курсіву — іератыкі, якая з'яўлялася спрашчэннем іерогліфікі. Абедзве разнавіднасці ўжываліся паралельна каля 3000 гадоў. Іератыкай пісаліся літаратурныя, навук. творы, дзелавыя паперы і інш. У 8 ст. да н. э. з іератыкі развіўся новы курсіў — дэмотыка, якая характарызуецца наяўнасцю большай колькасці лігатур і большай курсіўнасцю. Найпазнейшыя дэматычныя тэксты з 5 ст. н. э. Упершыню (1822) дэшыфраваў Е. п. Ж. Ф. *Шампальён*.

Літ.: Шампольон Ж.-Ф. О египетском иероглифическом алфавите, пер. с франц., Л., 1950; Истрин В. А. Возникновение и развитие письма, М., 1965. *М. А. Пайленка*. Мінск.

ЕГІПЕЦКАЯ МОВА, адна з *семіта-хамітскіх моў*. Падзяляецца на старажытнаегіпецкую (32—22 ст. да н. э., іерагліфічныя рэліг. тэксты), сярэднеегіпецкую, ці класічную (22—16 ст. да н. э., помнікі маст. л-ры), позднееегіпецкую (16—8 ст. да н. э., творы маст. л-ры і дакументы), дэматычную (8 ст. да н. э.—5 ст. н. э., дзелавыя паперы), коптскую (3—17 ст., пераважна рэліг. л-ра на аснове алфавітнага пісьма). Пасля зававання Егіпта арабамі (7 ст.) літ. і гутарковай мовай паступова стала арабская. Е. м. мёртвая. Найлепш вывучана марфалогія і сінтаксіс.

Літ.: Коростовцев М. А. Египетский язык, М., 1961; Яго ж. Введение в египетскую филологию, М., 1963. *А. Л. Міхневіч*. Мінск.

ЕГІПТАЛО́ГІЯ, комплексная навука, якая вывучае мову, гісторыю, культуру Ст. Егіпта.

Пачаткам Е. як навукі стала дэшыфроўка франц. вучоным Ж. Ф. Шампальёнам у 1822 т. зв. Разецкага каменя з надпісам на 2 мовах. Ён выдаў першую граматыку і слоўнік стараж.-егіп. мовы. Ням. археолаг Р. Лепсіус выдаў каштоўны збор першкрыніц, стварыў асновы храналагічнай перыядызацыі гісторыі Ст. Егіпта. Значны ўклад у Е. зрабілі франц. вучоныя А. Марыет, Г. *Масперо*, англ. У. Пітры Фліндэрс і інш. Заснавальнік Е. ў Расіі У. С. Голянішчаў сабраў вялікую калекцыю стараж.-егіп. матэрыялаў, апублікаваў працы па егіп. філалогіі і археалогіі. В. А. Тураеву належаць многія працы, найб. значнай — 2-томная «Гісторыя Старажытнага Усходу» (Л., 1935—36). В. В. *Струве* ўпершыню вырашыў пытанне аб грамадска-эканам. фармацыі стараж.-егіп. грамадства. Над праблемамі Е. працуюць У. І. Аўдзіеў, І. М. Лур'е, Ю. Я. Перапёлкін і інш. сав. гісторыкі.

Літ.: Постовская Н. М. Изучение древней истории Ближнего Востока в Советском Союзе (1917—1959 гг.), М., 1961.

ЕДЗЯЛЕЎ Пётр Васілевіч (н. 1909, в. Чукалы Лукаянаўскага пав. Ніжагародскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 26.9.1943 у ліку першых пераплыў Дняпро, узначаліў штурм варожых пазіцый праціўніка, знішчыў гранатамі 2 агнявыя кропкі ворага.


ЕЖА, гл. *Яда*.

ЕЗ, загарадзь на мелкаводных рэчках для затрымання ходу рыбы. Рабілі з калоў, жэрдак, галля і інш. У спецыяльна зробленых адтулінах ставілі пасткі (буч, кош, перат). Такі спосаб рыбалоўства быў шырока вядомы на Русі і Беларусі з стараж. часу. Суцэльную запруду без адтулін і пастак называлі закотай.

ЕЗВА, рака, левы прыток Грэзы (бас. Дняпра). Даўж. 23 *км*. Цячэ ў Быхаўскім р-не Магілёўскай вобл. Вадазбор (126 *км*²) на У Цэнтральнабярэзінскай раўніны. Паверхня плоская, забалочаная, аблесеная. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,6 *м*³/*сек*.

ЕЗУІТЫ (ад лац. Jesus Ісус), члены найбольш рэакц. манашскага каталіцкага ордэна «Таварыства Ісуса», які стварыў у 1534 іс. *Фармацыяй* і для ўмацавання *каталіцызму*. Ордэн пабудаваны на аснове строгай цэнтралізацыі, суровай дысцыпліны і беспярэчнага падпарадкавання радавых членаў кіраўніцтву. На чале стаіць генерал («чорны папа»), які выбіраецца пажыццёва і падначальваецца толькі папу рымскаму.


У сваёй дзейнасці Е. кіраваліся прынцыпам «мэта апраўдвае сродкі». Умешваліся ў паліт.



1



2




3




4

Егіпет Старажытны I.


1. Піраміда і памінальны храм фараона Джосера ў Сакара. Дойлід Імхатэп. 28 ст. да н. э.
2. Вялікі сфінкс фараона Хефрэна ў Гізе. Фрагмент. 28 ст. да н. э.
3. Гіпастыльная зала храма Амона-Ра ў Карнаку. Дойліды Аменхатэп Малодшы, Мая, Іупа і Хатыяі, сын Іупы. 15—13 ст. да н. э.
4. Калосы фараона Аменхатэпа III у Фівах («Калосы Мемнана»). Канец 15 ст. да н. э.
5. Роспіс пахавальні царыцы Нефертары ў Фівах. 1-я пал. 13 ст. да н. э.
6. Храм царыцы Хатшэпсут у Дэйр-эль-Бахары. Дойлід Сенмут. Пач. 15 ст. да н. э.
7. Скальны храм фараона Рамсеса II у Абу-Сімбеле. 1-я пал. 13 ст. да н. э.



5




6



7












Егіпет Старажытны II.

1. Пліта фараона Нармера. Каля 3000 г. да н. э.
2. Статуі царэвіча Рахатэпа і яго жонкі Неферт. Пахавальня Рахатэпа ў Медуме. 28 ст. да н. э.
3. Статуя царскага пісца Каі. Пахавальня Каі ў Сакара. Сярэдзіна 3-га тысячагоддзя да н. э.
4. Статуя царэвіча Каапера. Пахавальня Каапера ў Сакара. Сярэдзіна 3-га тысячагоддзя да н. э.
5. Аменхатэп, брат візіра Рамеса, і яго жонка. Рэльеф. Пахавальня Рамеса ў Фівах. Канец 15 ст. да н. э.
6. Галава царыцы Нефернеферуаціі. Амарна. 1-я чвэрць 14 ст. да н. э.
7. Паляванне фараона. Фрагмент роспісу. Пахавальня ў Фівах. Канец 15 ст. да н. э.
8. Галава жраца. Мемфіс. 5 ст. да н. э.







жыццё шмат якіх краін, што выклікала ўсеагульны пратэст. У 1773 ордэн быў фармальна забаронены, але не пераставаў існаваць. У 1814 афіцыйна адноўлены папствам. Е. пляраз імкнуліся прабраць у Рус. дзяржаву. Стаўленікамі польскіх магнатаў у Е. былі Ілжэдзмітрый I і Ілжэдзмітрый II. У пач. 17 ст. Е. як капеланы знаходзіліся ў войсках шведскіх інтэрвентаў супраць Рус. дзяржавы. На Беларусі і ў Літве распачалі дзейнасць в 2-й пал. 16 ст. Мэта — умацаванне пазіцый каталіцкай царквы, задушэнне рэфармацыйнага руху, акаталічванне бел. насельніцтва. Е.— натхняльнікі *Брэсцкай уніі 1596*. У 16—18 ст. на тэр. Беларусі стварылі 79 апорных пунктаў у выглядзе рэзідэнцый, місій і калегій (гл. *Езуіцкія калегіі і акадэміі*). Першая іх вышэйшая навуч. ўстанова ў Еўропе — Віленская езуіцкая акадэмія (1578) — стала гал. штабам экспансіі каталіцкай царквы супраць бел. народа. У 1820 Е. выгнаны з Расіі. Калі Зах. Беларусь была пад уладай бурж.-памешчыцкай Польшчы (1920—39), Е. падтрымлівалі пілсудчыкаў, імкнуліся паланізаваць беларусаў.

У сучасную эпоху Е. разам з рэакц. імперыял. коламі выступаюць супраць прагрэсу, сацыялізма і камунізма. Ордэн налічвае звыш 35 тыс. чл., пераважна ў ЗША і Іспаніі.

Літ.: Михневич Д. Е. Очерки из истории католической реакции. (Иезуиты), 2 изд., М., 1955; Великович Л. Н. Иезуиты вчера и сегодня, «Новая и новейшая история», 1967, № 4; Мараш Я. Н. Роль Ватикана в подготовке и утверждении Брестской унии 1596, у кн.: Вопросы истории религии и атеизма, [т.] 11, М., 1963; яго ж. Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви, Мн., 1969; яго ж. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии, Мн., 1971; Кирюшин П. М. Антинародная роль реакционного католического духовенства, Мн., 1948; Тонди А. Иезуиты, пер. с итальян., М., 1955.

Я. Н. Мараш. Гродна.

ЕЗУІЦКІЯ КАЛЕГІІ І АКАДЭМІІ, каталіцкія навуч. ўстановы, якія засноўваліся *езуітамі* на Беларусі, Украіне, Літве. Існавалі з 16 да пач. 19 ст. У 1570 засн. езуіцкая калегія ў Вільні (у 1578 рэарганізавана ў езуіцкую акадэмію), у 1581 — у Полацку (у 1812 пераўтворана ў *Полацкую езуіцкую акадэмію*), у 1584 — у Нясвіжы. У 17 ст. езуіцкія калегіі засн. ў Брэсце, Бабруйску, Віцебску, Гродне, Драгічыне, Магілёве, Мінску, Мерачы, Навагрудку, Оршы, Слуцку. У 70-я г. 18 ст. навуч. ўстановы езуітаў перададзены *Адукацыйнай камісіі*. Існавалі на Беларусі да 1820.

Сярэднія езуіцкія навуч. ўстановы — калегіі. Складаліся з 3—5 кл. Адукацыя мела пераважна гуманітарны характар. Навучанне схаластычнае. Вышэйшыя езуіцкія навуч. ўстановы — акадэміі. У Е. п. і а. у вучылў выхоўвалі рэлігійнасць, адданасць каталіцызму і справе ордэна езуітаў. Выхаванцаў прывучалі слепа падпарадкоўвацца старэйшым і начальству, прыстасоўвацца да любых абставін, выхоўвалі ў іх эгаізм, крывадушнасць, нянавісць да ўсяго новага. Сярод іх быў пашыраны ўзаемны шпіянаж, існавала абавязковая сістэма даносу. Кандыдаты на пасаду настаўніка праходзілі пільную праверку. Езуіцкія навуч. ўстановы мелі на мэце акаталічванне бел., укр. народаў, барацьбу супраць іх нац. культуры.

Літ.: Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі, Мн., 1968; Сапунов А. П. Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке, Витебск, 1890; Демьянович А. Иезуиты в Западной России в 1569—1772 гг., СПб., 1872; Гожалчинский А. Иезуитские школы в Юго-Западной России, «Труды Киевской духовной академии», 1869, т. 2; Истребов М. Иезуиты и их педагогическая деятельность в Польше и Литве, там жа, 1869, т. 1. *С. А. Падокшын.* Мінск.

ЕЗЯРБІШЧА, возера ў бас. р. Обаль, правага прытока Зах. Дзвіны, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 16,6 *км²*. Даўж. 8,3 *км*, найб. шыр. 2,6 *км*, сярэдняя 2 *км*, найб. глыб. 8,7 *м*, сярэдняя 3,3 *м*. Катлавіна выцягнутая з ПнЗ на ПдУ. Схілы пераважна спадзістыя, выш. да 5 *м*, укрытыя лесам; на Пн і ПнЗ стромкія. Дно няроўнае, пясчанае, найб. глыбіні ў сярэдняй частцы. На возеры 18 а-воў. Вадазбор (281 *км²*) сярэднеўзгорысты. Возера праточнае: з Пд упадаюць р. Агнеша і Дубоўка; сцёк у р. Обаль. Водзяцца плотка, лешч, шчупак, судак, акунь, верхаводка, язь, гусцяра, сом, карась; ёсць вугор.

ЕЗЯРЫШЧА, гар. пасёлак (з 1957) Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл., на беразе аднайменнага возера. Чыг. ст. на лініі Віцебск — Невель. За 41 *км* на Пн ад Гарадка, 80 *км* ад Віцебска. 2,7 тыс. ж. (1971).



Езярышча. Вуліца Ленінская.

Вядомае з 1377 як цэнтр Езярышчанскай вол. З 1580 належала Грахольскім, Сакалінскім, Агінскім, Панятоўскім, Салагубам. У пач. 19 ст. ва ўладанні беларускага ген.-губернатара герцага Вюртэмбергскага.

Прадпрыемствы: хлебазавод, камбінат бытавога абслугоўвання, лесаўчастак. Сярэдняя школа, васьмігадовая школа-інтэрнат, дзіцячы сад, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. Брацкая магіла 159 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні Е. і раёна.

ЕЛАВЕЦ, вёска ў Вялікаліпаўскім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Альшоўка. Цэнтр калгаса «Маяк». За 14 *км* на ПнУ ад Хоцімска, 221 *км* ад Магілёва, 43 *км* ад чыг. ст. Камунары. 458 ж., двароў 131 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Абеліск на ўшанаванне памяці воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕЛГАВА (б. Мітава), горад рэсп. падпарадкавання ў Латв. ССР, на р. Лielупе. Чыг. вузел. 52 тыс. ж. (1970). Харч. і лёгкая прамысловасць. Металаапрацоўка. Найб. прадпрыемствы: ільнопрадзільны камбінат, цукр. з-д, мясны і кансервавы камбінаты, з-ды: гарбарны, маш.-буд., с.-г. машынабудавання, буд. матэрыялаў і канструкцый. С.-г. акадэмія, муз. вучылішча. Гістар. і маст. музеі. Засн. Е. ў 1265 як крэпасць Мітава.

Літ.: Padomju Jelgava. Lit. rādītājs, Jelgavā, 1965.

ЕЛЕНКА, рака, левы прыток р. Бобр (бас. Дняпра). Даўж. 38 *км*. Пачынаецца з воз. Касмачэўскага, цячэ ў Талачынскім і Крупскім р-нах Віцебскай і Мінскай абл. Вадазбор

(170 км²) раўнінны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,1 м³/сек.

ЕЛЕНКА, рака, правы прыток Беседзі (бас. Сажа). Даўж. 24 км. Цячэ ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл. Вадазбор (102 км²) узгорысты. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,56 м³/сек.

ЕЛІЗАРАВА-УЛЬЯНАВА Ганна Ільінічна [14(26).8.1864, Ніжні Ноўгарад — 19.10.1935], прафесійная рэвалюцыянерка, савецкі парт. дзеяч, сястра і паплечніца У. І. Леніна. Чл. КПСС з 1898. У 1883 паступіла на Бястужаўскія вышэйшыя жан. курсы ў Пецярбургу. З 1886 удзельнічала ў студэнцкім рэвалюц. руху. У 1887 арыштавана па справе замаху А. І. Ульянава на Аляксандра III і прыгаворана да 5 гадоў ссылкі. У с.-д. руху з 1894. З восені 1898 чл. Маскоўскага к-та РСДРП. У 1903—04 на нелегальнай парт. рабоце ў Кіеве і Пецярбургу.



Супрацоўнічала ў газ. «Искра», «Вперед», «Пролетарий», «Правда» і інш., адна з стваральнікаў і рэдактараў час. «Работница». Пасля Люг. рэв. сакратар газ. «Правда». У 1918—21 працавала ў наркаматах сац. забеспячэння і асветы. Удзельнічала ў арганізацыі Гістпарта, Ін-та Маркса — Энгельса — Леніна (ІМЭЛ). Да канца 1932 супрацоўнік ІМЭЛ, сакратар і чл. рэдкалегіі час. «Пролетарская революция».

Тв.: Воспоминания об Александре Ильиче Ульянове, 3 изд., М.—Л., 1931; Воспоминания об Ильиче, М., 1971.

Літ.: Посвянский П., А. И. Ульянова-Елизарова, у кн.: Славные большевички, М., 1958.

ЕЛІСЕЕВІЧЫ, верхнепалеалітычная стаянка першабытнага чалавека, якая знаходзіцца ў в. Елісеевічы Бранскага р-на Бранскай вобл. Адкрыта К. М. Палікарповічам (1930), даследавалася Ф. М. Завярнілевым (1936), Палікарповічам (1935—46, 1948), М. В. Ваяводскім (1946), У. Да. Будзько (1963—68).

У культурным пласце рэшткі фауны (мамонта, дзікага каня, ваўка, пяшч. алення, пясца, бурага мядзведзя, сабакі і інш.), расшчэплены кремень, касцяны вугаль. Пры раскопках



Статуэтка жанчыны з Елісеевічаў. Эрмітаж.

выяўлены рэшткі пабудоў авальнай формы naземлянкавага тыпу, зробленыя з касцей мамонта; знойдзены крамнёвыя разцы, скрабкі, вастрыі, разнастайныя пласціны, у т. л. з прытупленым рэтушам краем, шмат прылад працы з косці і марскіх ракавін. Цікавыя знаходкі — авальныя пласцінкі з бівня мамонта, арнаментаваныя пад луску рыбы, а таксама жаночая статуэтка. Сталіка адносіцца да часу валдайскага абледянення, храналагічна блізкая да плямёнаў касцёнкаўска-аўдзеёўскай культуры і аналагічных помнікаў Чэхаславакіі, Аўстрыі і Францыі.

Літ.: Поликарпович К. М. Палеолит Верхнего Поднепровья, Мн., 1968; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970.

А. Г. Калечыц. Мінск.

ЕЛІСЕЕНКА Галіна Пятроўна (н. 27.8.1935, в. Букіно Кіраўскага р-на), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). У 1950—58 палявод, з 1958 даярка калгаса «Рассвет» імя Арлоўскага Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл.

ЕЛІСЕЕЎ Аляксей Станіслававіч (н. 13.7.1934, г. Жыздра Заходняй вобл.), лётчык-касманаўт СССР. Двойчы Герой Сав. Саюза (студз. і кастр. 1969). Канд. тэхн. н. (1967). Чл. КПСС з 1967. У 1956 скончыў Маск. вышэйшае тэхн. вуч. імя Баўмана. З 1966 у атрадзе касманаўтаў. Бортінжынер касм. карабля «Саюз-5» (камандзір карабля Б. В. *Валынаў*, інжынер-даследчык Я. В. *Хрунаў*), выведзенага на арбіту штучнага спадарожніка Зямлі 15.1.1969 для збліжэння з караблём «Саюз-4» (камандзір У. А. *Шаталаў*). Пасля збліжэння і стыкоўкі «Саюза-4» і «Саюза-5» Е. з Хруновым у скафандрах перайшлі праз адкрыты космас у карабель «Саюз-4». 17 студз. «Саюз-4» прызямліўся непадалёку ад Караганды. Е.— удзельнік першага ў свеце групавога касм. палёту на караблях «Саюз-6», «Саюз-7» і «Саюз-8». Касм. карабель «Саюз-8» быў выведзены на арбіту вакол Зямлі 13.10.1969 (камандзір Шаталаў, бортінжынер Е.) і прызямліўся 18 кастр. непадалёку ад Караганды. 23.4.1971 у складзе экіпажа касм. карабля «Саюз-10» (камандзір Шаталаў, бортінжынер Е. і інжынер-даследчык М. М. *Рукавішнікаў*) адзейсніў арбітальны палёт вакол Зямлі. 24 крас. «Саюз-10» быў састыкаваны з арбітальнай касм. станцыяй «Салют». Выканаўшы праграму палёту, 25 крас. касм. карабель прызямліўся за 120 км ад Караганды. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна.



ЕЛІСЕЕЎ Ігар Канстанцінавіч [н. 14(27).1.1917, Петраград], беларускі савецкі архітэктар. Канд. архітэктуры (1956). Скончыў Ленінградскі інж.-буд. ін-т (1941). З 1944 на Беларусі (у 1944—57 гал. архітэктар праектаў, кіраўнік майстэрні тыпавога праектавання Белдзяржпраекта, у 1957—63 нач. сектара жылля НДІ буд-ва і арх. Дзяржбуда БССР). З 1963 выкладчык Вол. політэхн. ін-та. Аўтар серыі тыпавых праектаў жылых дамоў.

ЕЛІСЕЕЎ Канстанцін Сцяпанавіч [2(14).3.1890, Пецярбург — 10.7.1968], рускі савецкі графік-карыкатурыст, мастак тэатра і кіно. Засл. дзеяч маст. РСФСР (1945). Скончыў школу Т-ва заахвочвання мастацтваў у Петраградзе (1915). У 1918 мастак, акцёр і рэжысёр 1-га франтавога паказальнага т-ра Палітаддзела 15-й арміі. З 1920 мастак БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы) у Мінску: у 1920 афарміў «На дне» М. Горкага (з С. Эйзенштэйнам), у 1921 «Залёты дзяка» У. Галубка, «Хам» паводле Э. Ажэшкі, «На купалле» М. Чарота, «Вясселле» В. Гарбацэвіча. У 1922 афармляў спектаклі рускай драм. трупы, у 1938 спектаклі Т-ра юнага гледача імя Крупскай «Наша зброя» А. Крона і «Ноч у верасні» І. Чэкіна ў Мінску. З 1922 у Маскве, карыкатурыст у час. «Крокодил» і інш. цэнтр. перыяд. выданнях. Стварaў касцюмы для кіно («Аляксандр Неўскі», «Масфільм», 1938) і цырка.


Літ.: Сыркина Ф. Я. Константин Степанович Елисеев, М., 1960.

ЕЛІСЕЙСКІЯ ПАЛІ, у старажытнагрэч. міфалогіі месціна шчасця. Тое, што *Элізіум*.

ЕЛІСТРАТАЎ Сяргей Аляксеевіч (7.10.1923, с. Малая Уладзіміраўка Сяміпалацінскага пав. Кірг. АССР — 14.9.1947), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942, камандзір развед. роты. Вызначыўся ў кастр. 1943 у Гомельскай вобл. Рота на чале з Е. фарсіравала Дняпро каля Лоева, захапіла траншэю ворага, адбіла тры контратакі; асабіста Е. знішчыў дзот. Гэта памагло астатнім падраздзяленням бесаправіцца цераз раку.

ЕЛКА (Picea), род вечназялёных аднадомных дрэў сям. хваёвых. Вядома каля 50 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі і Паўн. Амерыцы. У СССР 13 дзікарослых і 10 культурных відаў. На Беларусі каля 10 інтрадукаваных відаў і 1 дзікарослы — Е. еўрапейская, або звычайная, P. abies (P. excelsa).

Выш. Е. еўрапейскай 30—35 (50) м і да 1 м у дыяметры. Ствол просты, з густой конусападобнай кронай. Кара шэрая з чырванавата-бурым адценнем. Ігліца чатырохгранная, радзей плоскатая, завостраная, жыве на дрэве 5—9 гадоў. Насенне з крылаткамі. Пашырана пераважна ў паўн. і цэнтр. частках рэспублікі. Жыве Е. да 300—350 гадоў, расце усё жыццё. Цвіце ў маі — чэрв. Е.— цене- і холадаўстойлівая, кепска пераносіць сухое паветра. На Беларусі шэраг падвідаў, разнавіднасцей і формаў Е. еўрапейскай. Найб. пашыраныя: Е. усходнееўрапейская-раўнінная, Е. цэнтральнаеўрапейская-горная і Е. карпацкая. Драўніна Е. выкарыстоўваецца у буд-ве і у цэлюлозна-папяровай прамысловасці. Высакаякасная драўніна горнай Е. (т. зв. розанансавая) незаменная пры вырабе муз. інструментаў. Кара Е.— аснова сыравіны ахоўных жывых агароджаў уздоўж чыгунак і шашэйных дарог. У вялікім буд-ве рэспублікі вырошчваюцца Е. калючая, Е. канадская, або белая, Е. Энгельмана, Е. сібірская.



Елка звычайная: *1* — галінка з мужчынскімі шышкамі; *2* — ігліца; *3* — луска з насеннем; *4* — спелая жаночая шышка.

Літ.: Юркевич И. Д. и Гельтман В. С. Распространение ели в БССР, у кн.: Лесоводственная наука и практика, Мн., 1962; Юркевич И. Д., Голод Д. С. и Парфенов В. И. Типы и ассоциации еловых лесов, Мн., 1971.

В. І. Парфёнаў. Мінск.

ЕЛКА, вёска ў Сынковіцкім с/с Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр саўгаса імя XVIII парта'езду. За 25 км на У ад Зэльвы, 150 км ад Гродна, 15 км ад чыг. ст. Слонім. 495 ж., гасп. 147 (1971). Швейная майстэрня. Пач. школа, адда. сувязі, магазін. Помнік 82 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕЛЬКАЎШЧЫНА, вёска ў Лясніянскім с/с Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 8 км на У ад Круглага, 102 км ад Магілёва, 28 км ад чыг. ст. Талачын. 317 ж., гасп. 126 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Вёску двойчы (1943, 1944) часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕЛЬНЯ, балота вярховага тыпу ў Міёрскім і Шаркоўшчынскім р-нах Віцебскай вобл. Жыўленне атм. ападкамі. Мікрарэльеф сярэднекупісты. Расліннасць: карлікавая хвоя, сфагнавы мох, багун, балотны мірт, падбел, асака драбнакветная, журавіны. Плошча пакладаў торфу 16,8 тыс. га. Магутнасць пласта да 8,3 м, сярэдняя 3,79 м.

Узнікла на месцы вял. возера. Сярод балота асталіся астаткавыя азёры: Ельня, Чорнае, Доўгае і інш. Сапрапелевае дно балота ўкрыта асаковагіпнавым і драўнінна-пераходным торфам, што перакрываецца падвей-сфагнавым, шэйхцэрыева-сфагнавым, комплексна-вярховым і фускум-торфам.

ЕЛЬНЯ, возера ў бас. р. Ельні, левага прытока Дзісны (бас. Зах. Дзвіны), на балоце Ельня, у Міёрскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 5,2 км². Даўж. 4,7 км, найб. шыр. 1,5 км, сярэдняя 1,1 км. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Берагі багністыя. Вадазбор (23 км²) укрыты лесам і балотнай расліннасцю. Сцёк на пратоцы ў воз. Чорнае. Водзяцца плотка, лінь, шчупак, акунь, мянтуз; ёсць вугор.

ЕЛЬНЯ, рака, левы прыток Сажа. Даўж. 30 км. Цячэ ў Краснапольскім і Слаўгарадскім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (170 км²) на Пд Аршанска-Магілёўскай раўніны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,85 м³/сек.

ЕЛЬНЯ, вёска ў Зарацкім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Рака. Цэнтр калгаса «Зорка». За 5 км на ПнЗ ад Браслава, 235 км ад Віцебска, 35 км ад чыг. ст. Друя, на шашы Браслаў — г. п. Турмантас (Літ. ССР). 41 ж., гасп. 17 (1971). Мех. майстэрня, лесапільня. Клуб.

ЕЛЬНЯ, вёска ў Чарнінўскім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Еленка. Цэнтр калгаса «Авангард». За 17 км на З ад Хоцімска, 174 км ад Магілёва, 25 км ад чыг. ст. Камунары. 235 ж., двароў 78 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, антэка, вет. пункт, адда. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.


ЕЛЬСК (б. **Каралін**), горад (з 1971), цэнтр Ельскага р-на Гомельскай вобл. Чыг. ст. на лініі Калінкавічы — Оўруч. Аўтобусная станцыя. За 177 *км* на ПдЗ ад Гомеля, 6,7 тыс. ж. (1971). У пісьмовых крыніцах упамінаецца з 16 ст. У 18 ст. вядомы як мястэчка Мазырскага пав. Належаў Спадам, потым Казіміру Аскерку. Мэблевая ф-ка, пладова-агародніны з-д, маслазавод, палігон



Ельск. Плошча імя Леніна.

жалезабетонных вырабаў, раённае і спец. аб'яднанні Сельгастэхнікі, лясгас, леспрамгас. Сярэдняя і 8-гадовая школы, сярэдняя школа-інтэрнат, школа рабочай і сельскай моладзі, муз. і дзіцячая спарт. школы, Дом піянераў, Дом культуры, 4 дашкольныя ўстановы, 2 масавыя б-кі, бальніца. Музей пар. славы. Помнік У. І. Леніну. Абеліск на ўшанаванне памяці сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці Героя Сав. Саюза Я. *Палепкі*. Помнік драўлянага дойлідства 18 ст. *Ельская Троіцкая царква*.

ЕЛЬСКАЯ ТРОІЦКАЯ ЦАРКВА, помнік драўлянага дойлідства канца 18 ст. Пабудаваная ў г. п. Ельску (Гомельская вобл.). Складаецца з сістэмы зрубаў (пастаўленых па крыжы) з шатровай званіцай над уваходам. Цэнтрычная будова падкрэслена сярэднім зрубам, які пераходзіць у васьмігранны барабан,



Ельская Троіцкая царква (малюнак).

пакрыты вял. сферычным купалам з малым васьмігранным барабанам і купалком. Царква мае выразны сілуэт. Сцены фасадаў аштыляваны вертыкальна і гарызантальна дошкамі. На аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю Е. Т. ц. паўплывалі традыц. прыёмы класічнага манумент. дойлідства. *У. В. Трацэўскі*. Мінск.

ЕЛЬСКІ Аляксандр Карлавіч (16.6.1834, в. Дудзічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.—10.9.1916), беларускі бурж. этнограф, гісторык, экапаміст і пісьменнік. Памешчык. Скончыў Мінскую гімназію (1852). Даследаваў гісторыю, этнаграфію, мову і л-ру, фальклор Беларусі. У «Геаграфічным слоўніку зямель польскіх і іншых краёў славянскіх» апісаў мясцовасці амаль усіх бел. паветаў. Напісаў працы: «Пра беларускую гаворку» (1885), «Слоўнік жабрачае гаворкі на Белай Русі» (1886), «Слова пра матэрыялы для вывучэння беларускай гаворкі, этнаграфіі і літаратуры» (1886), «Адам Міцкевіч на Беларусі» (1885) і інш. У сваім маёнтку Замосце (Ігуменскі пав.) арганізаваў (1864) прыватны краязнаўчы музей, фонды якога налічвалі каля 20 000 рукапісаў, 7000 кніг, болей за 2000 гравюр і малюнкаў, тысячы запісаў бел. фальклору, дыялектнай лексікі, мноства рэчаў і г. д. (большасць экспанатаў загінула, некат. трапілі ў музеі і архівы Вільнюса, Мінска і Польшчы). З рэакц. пазіцый ацэньваў зб. вершаў «Жалейка» Я. Купалы. Аўтар дыдакт. вершаў на бел. мове ў духу хрысціянскай маралі. Пераклаў на бел. мову 1-ю частку «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча (Львоў, 1892).

Тв.: Rys dziejów gospodarstwa krajowego w zestawieniu z obyczajami narodu od czasów pierwotnych aż do ostatnich, t. 1—2, Kraków, 1893—97; Zarys obyczajów szlachty w zestawieniu z ekonomiką i dolą ludu w Polsce i Litwie, t. 1—2, Kraków, 1897—98.

Літ.: Лужанін М. Вачыма часу, Мн., 1964, с. 56—64; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе, Мн., 1969; Старонкі літаратурных сувязей, Мн., 1970, с. 160—162.

ЕЛЬСКІ Канстанцін Міхайлавіч (17.2.1837, в. Ляды Ігуменскага пав. Мінскай губ.—26.11.1896), заолаг і падарожнік. Скончыў Мінскую гімназію (1853). Вучыўся на мед. ф-це Маск. ун-та (1853—56), скончыў матэм.-прыродазнаўчы ф-т Кіеўскага ун-та (1860). Адзін з першых у Расіі падтрымаў эвалюц. тэорыю Ч. Дарвіна. Удзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання 1863 на Украіне. Каб пазбегчы арышту, эміграваў за мяжу. Як заолаг і геолаг працаваў у Турцыі, Германіі і Францыі. У 1865 выехаў у Гвіяну, у 1869 у Перу. Вывучаў фаўну гэтых краін. Адкрыў новы від жывёлы Dinonys. З 1878 жыў у Кракаве. У гонар вучонага адзін з відаў лаўра названы Ocotea Jelscii. Апісанне многіх птушак і звяроў давалася па калекцыі Е., некат. віды названы яго імем.

Тв.: Popularno-przyrodnicze opowiadania z pobytu w Gujanie francuskiej i po części w Peru (od roku 1865—1871), Kraków, 1898.

Літ.: Грицкевич В. П. Путешествия наших земляков, Мн., 1968, с. 120—137; Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе, Мн., 1969.

В. П. Рагойша. Мінск.

ЕЛЬСКІ Міхаіл Карлавіч (8.10.1831, в. Дудзічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.— студз. 1904), скрыпач і кампазітар. Вучыўся ў скрыпача К. Кжыжаноўскага ў Мінску. Скончыў муз. школу ў Вільні (1849), быў вольным слухачом Кіеўскага ун-та. У Кіеве выдаў свае скрыпічныя кампазіцыі (1852). Муз. майстэрства ўдасканальваў у скрыпачоў К. Ліпінскага і А. В'ётана. З 1875 жыў у Дудзічах. У 1861—79 гастраляваў у Мінску, Кіеве, многіх польск. і ням. гарадах. Напісаў каля 100 муз. твораў: 2 скрыпічныя канцэрты, паланезы, мазуркі, скрыпічныя фантазіі і інш. У нек. выкарыстаў бел. нар. мелодыі, якія сам запісваў.

Літ. тв.: Kilka wspomnień o przeszłości muzyki na Litwie, «Echo muzyczne», 1881, № 22—23; Studia muzyczne, Mińsk, 1899.

Літ.: Даміні коўскі Ф. Кампазітар і скрыпач М. Ельскі, «Беларусь», 1946, № 8.

В. П. Рагойша. Мінск.

ЕЛЬСКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 1.9.1924. Размешчаны на Пд вобласці. Пл. 1,4 тыс. *км*². Нас. 27,9 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 9 сельсаветаў. Цэнтр г. п. Ельск.


Тэр. раёна пераважна раўнінная, ляжыць у межах Мазырскага Палесся. Паўн.-ўсх. і паўд.-зах. часткі ўзвышаныя. На ПнУ раўніна паступова павышаецца да 160 *м* над узр. м., характэрны згладжаны дробнаўзгорысты рэльеф. На ПдЗ — адгалінаванні Оўруцкага кража. Карысныя выкапні: 2 радовішчы торфу з агульнымі запасамі 32,9 млн. *т*, у т. л. радовішча Гала — 27,8 млн. *т*; 3 радовішчы



Краявід паблізу Ельска.

цагельнай сыравіны — 0,25 млн. *м*³, у т. л. радовішча Дзяртное — 0,15 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —5,7, ліп. 18,7 °С. Ападкаў 573 *мм* за год. Вегет. перыяд 199 дзён. Рэкі: Славечна з прытокамі Чэрцень, Ясенец, Жалонь; Батыўля з каналамі Валаўскім і Высока-Махновіцкім; Мытва (прыток Прыпяці). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (22,4%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (35,3%), дзярнова-балотныя (8%), тарфяна-балотныя (26,6%), алювіяльныя (7,7%). З мінер. глебаў 6,3% суглінкавых, 42,9% супясчаных, 50,8% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 36 (цана бала 0,23 *ц/га* збожжа), усіх с.-г. угоддзяў 29. Пад лесам 50,7% тэр. Пераважаюць хваёва-шыракалістыя лясы, трапляюцца бярозавыя і дубова-грабовыя. Па забалочаных нізінах Славечны і Батыўлі пашыраны альхова-асінавыя лясы. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы. Сярэдняя шчыльн. 19,9 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас. 24%.


Амаль усе прамысл. прадпрыемствы сканцэнтраваны ў Ельску: палігон жалезабетонных вырабаў, мэблевая ф-ка, пладова-агародніны з-д, маслазавод, прамкамбінат (вытворчасць цэглы і сталярных вырабаў), лясгас, леспрамгас, камбінат быт. абслугоўвання. Раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, Славечанскае спецыялізаванае аб'яднанне Сельгастэхнікі (Ельск). У раёне 9 калгасаў і 4 саўгасы (1971).



Калгасы і іх цэнтры: «Абарона Савета» (*Некрашоўка*), «XX з'езд КПСС» (*Роза Люксембург*), «Звязда» (*Старое Высокае*), імя Калініна (*Валаўская Рудня*), «Партызан» (*Рамязы*), «1 Мая» (*Падгалле*), «Рэвалюцыя» (*Кочышча*), «40 гадоў Кастрычніка» (*Дуброва*), «Шлях Леніна» (*Засінцы*). Саўгасы і іх цэнтры: «Валаўскі» (*Валаўск*), «Дабрынь» (*Млынок*), «Ельскі» (*Камуна*), «Скарадзінскі» (*Скароднае*).

С. гасп. мяса-малочнага кірунку. Гадоўля буйн. раг. жывёлы, свіней, развіта бульбаводства, ільнаводства. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 32% тэр. На канец 1970 асушана 18,7 тыс. *га* балот і забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 25,1, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 10,7, тэхнічнымі 0,6, бульбаю 4,1, кармавымі культурамі 9,6. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 25,4 (у т. л. кароў 11,5), свіней 10,4, авечак і коз 1,6. Па тэр. раёна праходзіць чыгунка Калінкавічы — Оўруч (УССР), аўтамаб. дарога Мазыр — Оўруч і інш. На пач. 1971 было: 9 сярэдніх, 10 васьмігадовых, 38 пач. школ, 1 завочная школа, 3 дашкольныя ўстановы, 27 клубных устаноў, 24 масавыя б-кі, 27 кінаўстановак, 4 бальніцы, 18 фельч.-ак. пунктаў; працавала 330 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 50 інжынераў, 16 аграномаў, 12 заатэхнікаў і вет. урачоў, 196 настаўнікаў, 24 урачы; 637 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Ленінская праўда». *Т. І. Гузава*. Мінск.

Укладка гапчарнага дрэнажу ў саўгасе «Дабрынь».



ЕЛЬСКІЯ, шляхецкі род. Вядомы з 16 ст. ў Польшчы, з пач. 17 ст. асеў у Пінскім, а потым у Ігуменскім пав. У пач. 20 ст. Е. пражывалі на тэр. Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губ. і ў Польшчы.

Канстанцін (пасля 1738—21.10.1799), дэпутат Літ. трыбунала з 1780, дэпутат сейма ў 1786 ад Гродзенскага пав. і 1790 ад Старадубскага пав. У час паўстання 1794 камендант узброеных сіл Гродзенскага пав.

Станіслаў (пасля 1738—3.1.1829), чл. Літ. скарбовай камісіі з 1784, скарбовы камісар Вял. кн. Літ. да 1792. Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай маршалак шляхты Ігуменскага пав. Мінскай губ. (1795—1812).

Францішак (1738—23.3.1821), гродзенскі скарбнік. З 1783 маршалак Літ. трыбунала. Удзельнік паўстання 1794. *А. П. Грыцкевіч.* Мінск.

ЕЛЬЯШЭВІЧ Міхаіл Аляксандравіч [н. 8(21).8.1908, Мюнхен], беларускі савецкі фізік. Акад. АН БССР (1956), д-р фіз.-матэм. н. (1945), праф. (1948). Чл. КПСС з 1945. Скончыў у 1930 Ленінградскі дзярж. ун-т. У 1930—56 працаваў у ВНУ і НДІ Ленінграда і Масквы, у 1956—68 у Ін-це фізікі АН БССР. З 1968 узначальвае кафедру атамнай і малекулярнай фізікі БДУ. Аўтар навук. прац па тэарэт. спектраскапіі. Распрацаваў асновы тэорыі ваганняў і вагальных спектраў многаатамных малекул, выканаў шэраг даследаванняў па спектраскапіі рэдкіх зямель, нізкатэмпературнай плазмы і па інш. пытаннях атамнай і малекулярнай спектраскапіі. Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл. Ленінская прэмія 1966, Дзярж. прэміі СССР 1949, 1950. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.



Тв.: Простой метод расчета частот колебаний многоатомных молекул, «Доклады АН СССР», 1940, т. 28, № 7; (разам з М. У. Валькенштэйнам і Б. І. Сцяпанавым). Колебания молекул, т. 1—2, М.— Л., 1949; Спектры редких земель, М., 1953; Атомная и молекулярная спектроскопия, М., 1962; Периодический закон Д. И. Менделеева, спектры и строение атома, «Успехи физических наук», 1970, т. 100, в. 1.

Літ.: Михаил Александрович Ельяшевич (К 60-летию со дня рождения), «Журнал прикладной спектроскопии», 1968, т. 9, в. 2.

ЕЛЯНЕЦ, вёска ў Недайскім с/с Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 25 км па ПдЗ ад Буда-Кашалёва, 50 км ад Гомеля. 536 ж., гасп. 211 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕМ (фін. Häme), фіна-балцкае племя, якое ў 1-м тысячагоддзі н. э. жыло на тэр. Фінляндыі. Асн. занятак: лясныя промыслы, рыбалоўства, гандаль. Упамінаецца ў «Аповесці мінулых часоў». У 11—12 ст. плаціла даніну Ноўгараду, у канцы 12 ст. заваявана шведамі. Е. разам з сум'ю і інш. плямёнамі назней утварыла фінскую народнасць.

ЕМЕЛЬЯНОВА, вёска ў Глодзенскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 20 км на Пн ад Лёзна, 40 км ад Віцебска, 22 км ад чыг. ст. Лёзна. 104 ж., гасп. 33 (1971). Пач. школа, аддз. сувязі, магазін. У студз. 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 15 мірных жыхароў.

ЕМЯЛЬЯНАВА, вёска ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 7 км на ПнЗ ад Смалявіч, 45 км ад Мінска, каля шашы Смалявічы — Лагойск (1 км). 206 ж., гасп. 80 (1971). Клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Несцер Пятровіч [30.10(11.11).1898, в. Ляцягі Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 29.9.1970], беларускі савецкі хімік. Д-р хім. н. (1970). З сялян. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў Гомельскі пед. ін-т (1932). У 1956—70 працаваў у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН БССР, з 1962 заг. лабараторыі нафта-хім. сінтэзу. Даследаванні ў галіне хіміі нафтэнавых вуглевадародаў, у прыватнасці гідраперакісных злучэнняў. Распрацаваў новыя тэхнічна прымальныя метады атрымання α, β-непасычаных кетонаў, спіртоў, дыкарбонавых кіслот, мона- і спалучаных дыалефінаў, паліёлаў і іх шматлікіх вытворных на аснове гідраперакісаў вуглевадародаў цыклічнай структуры. Аўтар болей як 20 вынаходстваў.

Тв.: (У сааўт.) О способе получения циклогексен-1-она-3 из гидроперекиси циклогексена, «Доклады АН БССР», 1966, т. 10, № 4; (з Э. А. Ларцінай) Разработка методов получения химически чистого циклогексен-1-она-3, «Весці АН БССР. Сер. хім. навук», 1969, № 4; (з А. М. Шэўчык) Новый способ получения тетралевой кислоты окислительным расщеплением тетралилгидроперекиси, «Доклады АН БССР», 1969, т. 13, № 4.

ЕМЯЛЬЯНАЎ Ніл Дзянісавіч [н. 27.5(9.6). 1905, в. Малашанкі Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1929. У 1930—41 на сав. і парт. рабоце ў Слуцкім і Капыльскім р-нах. У партызанах з кастр. 1942— камісар атрада, з 23.9.1943 камісар *партызанскай брыгады 27-й* імя В. І. Чапаева Мінскай вобл., адначасова з мая 1943 сакратар Капыльскага падпольнага РК КП(б)Б. У ліпені 1944—48 на парт. і сав. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Магілёве.

ЕНАПОЛЛЕ, вёска ў Чарняўскім с/с Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Беседзь (0,5 км). Цэнтр калгаса «Савецкая Беларусь». За 12 км на ПдЗ ад Хоцімска, 177 км ад Магілёва, 28 км ад чыг. ст. Камунары. 209 ж., гасп. 70 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 26.9.1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. 2 помнікі 144 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕНДРЫХОЎСКІ (Jędrychowski) Стэфан (н. 19.5.1910, Варшава), польскі дзярж. дзеяч, удзельнік рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З сям'і настаўніка. Чл. КПЗБ, ПАРП. З 1933 адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфаш. адзін з арг-цыі «Студэнцкая лявіца «Фронт» у Віленскім уп-це, якая аб'ядноўвала прагрэс. моладзь і была пад уплывам КПЗБ і КПП, супрацоўнік *пе* газ. «Poprostu» («Папросту») і «Karta» («Карта») у 1935—36. Удзельнік Антыфаш. кангрэсу работнікаў культуры ў Львове (1936). У 1937 засуджаны на 4 гады. З 1939 у СССР. У Айч. вайну адзін з арганізатараў Саюза польскіх патрыётаў у СССР і 1-й дывізіі імя Т. Касцюшкі. З 1944 працаваў у Польскім к-це нац. вызвалення. З 1945 у складзе ўрада ПНР, са снеж. 1968 міністр замежных спраў ПНР. Чл. Палітбюро ЦК ПАРП (з 1956). Дэпутат сейма (з 1947).

ЕНІСЕЙ (эвенкскае Иоанеси — вялікая рака), рака ў Азіяцкай частцы СССР, пераважна ў Краснаярскім краі РСФСР. Е. лічаць граніцай паміж Зах. і Усх. Сібір'ю. Даўж. 4092 км (лічачы за вытак р. Вялікі Енісей), пл. бас. 2580 тыс. км². Утвараецца ад зліцця Вялікага Е. (Бій-Хем) і Малога Е. (Ка-Хем). Вял. Е. пачынаецца на схілах Усх. Саяна ў Тувінскай а. в. РСФСР, Малы Е.— у Дархацкай катлавіне (МНР) і наз. Шыхід-Гол, потым Кызыл-Хем і Ка-Хем. Упадае Е. у Енісейскі зал. Карскага м.


Цячэнне Е. падзяляецца на тры ч.: верхняе (ад зліцця Бій-Хема і Ка-Хема да ўпадзення р. Абакан), сярэдняе (паміж р. Абакан і Ангарой), ніжняе (ад Ангары да вусця). У вярхоўі Е. цячэ па ўзгорыстым стэпе Тувінскай катлавіны і наз. Улуг-Хем. Рэчышча (шыр. 100—600 м) падзелена на асобныя рукавы і пратокі, спакойныя плёсы чаргуюцца з порогамі і вадаспадамі. Ад упадзення р. Хемчык на працягу 280 км Е. пераразае Зах. Саян. Даліна вузкая, месцамі каньёнападобная, шыр. да 100 м. У рэчышчы камяністыя перакаты і парогі (Вялікі, Дзедушкін, Джойскі і інш.), скорасць цячэння да 10 м/сек. Ры выхадзе Е. ў Мінусінскую катлавіну даліна расшыраецца да 5—15 км, рэчышча да 500—800 м, шмат а-воў. Паміж Мінусінскам і Краснаярскам у адгор'ях Усх. Саяна даліна звужаецца, скорасць цяч. 1,5—3 м/сек. Каля Краснаярска на правым беразе малаўнічыя скалы — запаведнік «Слупы». Ніжэй Краснаярска даліна расшыраецца, пасля ўпадзення Ангары 10—20 км (макс. 40 км), левы бераг нізінны, правы ўзвышаны (Енісейскі кряж). Вышэй вусця Падкаменнай Тунгускі Асінаўскі парог. Ніжэй Дудзінкі Е. цячэ па Паўночна-Сібірскай нізіне. Шыр. даліны да 150 км, рэчышча 5—10 км, глыб. 14—28 м. За 300 км да ўпадзення ў мора вусцевы (марскі) участак Е. падзяляецца на пратокі, з якіх найбольшыя Каменны Е., Вялікі Е., Малы Е., Ахоцкі Е. Гал. прытокі: злева — Абакан, Сым, Турухан; справа — Туба, Кан, Ангара, Падкаменная Тунгуска, Ніжняя Тунгуска, Курэйка. Жыўленне снегавое, дажджавое і грунтавое. Рэжыму Е. характэрна высокае вясновa-летнее разводдзе і ўстойлівая асенне-зімовая межань. Частыя летнія дажджавыя паводкі. На верхнім і сярэднім Е. разводдзе пачынаецца ў канцы крас.— пач. мая, на ніжнім — у сярэдзіне мая — пач. чэрвеня і цягнецца 2—3 месяцы. Сярэднегадавая амплітуда ваганняў узроўню вады каля Кызыла 4,5 м, Енісейска 11 м, Ігаркі 17 м. У нізоўях (Дудзінка, Усць-Порт) прыліўна-адліўныя і згонна-нагонныя ваганні. Шматгадовы сярэдні расход вады каля Кызыла 1000 м³/сек, Енісейска 7750 м³/сек, Ігаркі 17 600 м³/сек, у вусці 19 800 м³/сек. Ледастаў каля Кызыла і Краснаярска з канца ліст. да пач. мая, у нізоўі з канца кастр. да пач. чэрвеня. Найб. тоўшча лёду каля Кызыла 192 см, Енісейска 98 см, Усць-Порта 183 см. Веснавы ледаход у верхнім і сярэднім цяч. 11—18 дзён, у нізоўі 5—10 дзён. Часта бываюць заторы, ад якіх рэзка падымаецца ўзровень вады. Т-ра вады ў сярэдзіне лета ў верхнім і сярэднім цячэнні 14—20 °С, у нізоўі 8—17 °С. Сярэдні гадавы цвёрды сцёк у вусці 10,5 млн. т, сцёк раствораных рэчываў каля 30 млн. т.



Енісей у Заходнім Саяне.

Рэгулярнае суднаходства ад прыстані Азначанае (120 км вышэй Мінусінска) да вусця; да Ігаркі (973 км ад вусця) падымаюцца марскія судны. Навігацыя каля Краснаярска 190—200, каля Дудзінкі да 120 дзён. Рыбныя промыслы развіты пераважна ў нізоўях Е. (асетр, сцерлядзь, омуль, селядзец, нельма, бялуга і інш.). Е. выкарыстоўваецца для лесасплаву і як буйная крыніца гідраэнергіі. Пабудавана Краснаярская ГЭС (магутн. 6 млн. квт, пл. вадасх. 2130 км², аб'ём 77,5 км³). Будуецца (1970—73) Саяна-Шушанская ГЭС (магутн. 6,3 млн. квт). Праектуецца пабудаваць каскад ГЭС (Майнскую, Ачурскую, Мінусінскую, Енісейскую, Асінаўскую, Ігарскую і інш.). Гал. гарады і порты: Мінусінск, Краснаярск, Енісейск, Турухансk, Ігарка, Дудзінка.

Краснаярская ГЭС.



Літ.: Глазков М. М. Енисей — великая сибирская река, М., 1959; Лыжин К. Д. По Енисею. Путеводитель-справочник, Красноярск, 1961.

Б. Б. Багаслоўскі. Мінск.

ЕНУКІДЗЕ Авель Сафронавіч [парт. псеўд. Авель, Абдул, «Залатая рыбка»; 7(19).5.1877, в. Цхадысі Кутаіскай губ.— 30.10.1937], рэвалюцыянер, савецкі дзярж. дзеяч. З сялян. Чл. КПСС з 1898. У 1897—1900 рабочы на чыгунцы. Адзін з заснавальнікаў Бакінскай

с.-д. арг-цыі. У 1901 стварыў падпольную друкарню «Іскра» і працаваў у ёй да 1906. У 1901, 1910 чл. Бакінскага к-та РСДРП. З 1906 на парт. рабоце ў Закаўказзі, Растове-на-Доне, Маскве, Пецярбургу, супрацоўнік газ. «Правда». У 1912 і 1914 сасланы. З 1916 у арміі. Удзельнік Лют. рэв. ў чэрв. 1917 чл. выканкома Петраградскага Савета. На II з'ездзе Саветаў выбраны чл. ВЦВК. На I—VII з'ездах Саветаў СССР выбіраўся чл. Прэзідыума і сакратаром ЦВК СССР. На XIII—XVI з'ездах ВКП(б) выбіраўся чл. ЦКК, на XVII — чл. ЦК.

ЕПІСКАП (грэч. episkopos наглядчык), біскуп, вышэйшы духоўны сан, ступень царкоўнай іерархіі ў большасці хрысціянскіх цэркваў. Першыя звесткі пра Е. адносяцца да 2 ст. У раннехрысціянскіх абшчынах яны наглядалі за абшчыннай маёмасцю, потым узначалілі царк. апарат. Старэйшых ці асабліва паважаных Е. наз. архіепіскапамі.

ЕПІШАЎ Аляксей Аляксеевіч [н. 6(19).5.1908, Астрахань], савецкі парт., дзярж. і ваенны дзеяч, ген. арміі (1962). З рабочых. Чл. КПСС з 1929. Скончыў Ваен. акадэмію матарызацыі і механізацыі Чырв. Арміі (1938). У Чырв. Арміі з 1930. З 1938 на парт. рабоце, першы сакратар Харкаўскага абкома і гаркома КП(б)У; нам. наркома сяродняга машынабудавання. З 1943 чл. Ваен. савета 40-й, 38-й армій. З 1946 сакратар ЦК КП(б)У, першы сакратар Адэскага абкома і гаркома партыі, з 1951 нам. міністра дзярж. бяспекі СССР. У 1955—62 надзвычайны і паўнамоцны пасол СССР у Румыніі, Югаславіі. З мая 1962 нач. Галоўнага паліт. управлення Сав. Арміі і ВМФ. На XIX, XX, XXII з'ездах КПСС выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XXIII і XXIV — чл. ЦК КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 1, 3, 4, 6—8-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 9 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнамі замежных краін.

ЕРАМЕЕЎ Канстанцін Сцяпанавіч (6.6.1874, Мінск — 28.1.1931), савецкі партыйны і ваенны дзеяч, журналіст. Чл. КПСС з 1896 (уступіў у Вільні ў с.-д. групу С. *Трусевіча*). Удзельнічаў у арганізацыі стачак, вёў рэвалюц. прапаганду сярод рабочых і салдатаў. У жн. 1896 арыштаваны, у 1898 высланы ў Уржум пад нагляд паліцыі. У 1902 на падпольнай рабоце ў Саратаве. У 1903 в ссылкі (Стэрлітамак) уцёк за мяжу, у Жэневе сустракаўся з У. І. Леніным, быў агентам «Искры». З 1910 у рэдакцыі газ. «Звезда» (першы афіцыйны рэдактар-выдавец), потым «*Правда*» (адзін з рэдактараў). У 1-ю сусв. вайну ваяваў ваен. арганізацыяй Паўн.-Балтыйскага к-та РСДРП(б). Увосень 1917 вёў парт. работу на Паўн. фронце, потым у Петраградзе, чл. Петраградскага ВРК, удзельнік штурму Зімняга палаца, ліквідацыі мяцяжу Керанскага — Краснова. На чале ваеннага атрада накіраваны на данамогу рэвалюц. сілам Масквы. З снеж. 1917 камандуючы войскі Петраградскай ваен. акругі, удзельнічаў у фарміраванні першых часцей Чырв. Арміі і арганізацыі адпору герм. інтэрвенцыі. У 1919—22 на сан., ваен. і парт. рабоце. З 1923 чл. РВС Балт. флоту, з 1925 нач. паліт. управлення Балтыйскага флоту і чл. РВС СССР. З 1926 на гасп. і літ. рабоце.

Літ.: Большевик-правдист. Воспоминания о К. С. Еремееве, М., 1965. *Р. В. Пушкіна.* Мінск.

ЕРАМЕЕЎШЧЫНА, вёска ў Маласавінскім с/с Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 6 км на ПдУ ад Дуброўна, 113 км ад Віцебска, 12 км ад чыг. ст. Асінаўка, каля шашы Дуброўна — в. Ваева (2 км). 223 ж., гасп. 73 (1971). Нач. школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, магазін. У 1943 нямецка-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску, загубілі 29 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 6 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЕРАНІМ ПРАЖСКІ (Jeroným Pražský; каля 1371—30.5.1416), чэшскі рэфарматар, паплечнік Яна *Гуса*, вучоны, прамоўца. Скончыў Пражскі ун-т (1398). Выкладаў ва ун-тах Парыжа, Гейдэльберга, Кёльна. Прыхільнік ідэй англ. рэфарматара Дж. Уікліфа. Шмат падарожнічаў, выступаў з пропаведзямі, у якіх выкрываў злоўжыванні каталіцкага духавенства, пям. васілле ў Чэхіі. Шукаючы прыхільнікаў у суседніх славянскіх землях, наведаў Вільню, Віцебск, Кракаў, Пскоў. Паводле пісьма кракаўскага епіскапа, Е. П. быў у Вял. кн. Літ. нядоўга, але выклікаў такое хваляванне ў духавенстве і народзе, якога не ведалі ў гэтых краях. Спадзеючыся выратаваць Гуса, паехаў у Канстанцу на царк. сабор. Асуджаны саборам як ерэтык і спалены.

Літ.: Сапунов А. (сост.), Витебская старина, т. 1, Витебск, 1883 [документ 10]; Мацек Й. Табор в гуситском революционном движении, пер. с чеш., т. 1, М., 1956; Šmahel F. Jeroným Pražský, Praha, 1966.

ЕРАСЬ (ад грэч. hairesis першапачаткова адбор, лепшае вучэнне, школа, секта), адхіленне ад артадаксальнага рэлігійнага вучэння, спецыфічная форма пратэсту супраць пануючай царквы і сацыяльных адносін.

Е. пазнарабаўладальніцкага і раннефеад. перыяду: *арыянства*, несторыянства, манафізіцтва, маніхейства, паўлікіянства, багамільства і інш. У Зах., Цэнтр. і Усх. Еўропе ў сярэднія вякі выступалі супраць феад.-царк. прыгнёту: *катары*, *альбігойцы*, *вальдэнсы*, *арнальдысты*, *пікарды*, *гусіты*, *таборыты*, *адамітскія* і *анабаптысцкія* плыні, *пратэстантызм*. Ерэтычныя рухі набывалі рэвалюц. характар, калі ў іх удзельнічалі сялянскія і гарадскія нізы, як, напр., у Англіі ў 14 ст. пад кіраўніцтвам Дж. Болла і Дж. Ўота, у Германіі ў 16 ст. пад кіраўніцтвам Т. Мюнцэра. Ерэтычныя вучэнні ідэйна падрыхтавалі Рэфармацыю. З канца 17 ст. Е. паступова траціць ролю антыфеад. і рэвалюцыянерскай апазіцыі існуючаму ладу і пануючай царкве.

На Беларусі ерэтычныя брадзільні відаць з часоў Кіеўскай Русі. У нач. 15 ст. сляды ерэтычнага руху засведчаны ў Віцебскай зямлі, Полацкай зямлі, Гродне, Слуцку, Клецку, Нясвіжы, Мінску, Гомелі, Рэчыцы, Магілёве, Мсціславе, Оршы, Копысі, Чавусах, Крычаве, Клімавічах, Чэрыкаве, Бабруйску, Рагачове, Быхаве, Слоніме, Гародні, Ваўкавыску, Брэсце, Пінску, Кобрыне, Мазыры, Тураве, Пінску, Давыд-Гарадку

50 *км*, выш. да 218 *м*. Е. круга абрываюцца на У і паката на З. Складзена з неагенавых глінаў, вапнякоў, пясчанікаў. Расліннасць паўпустынная, ёсць саланчакі. Па ярах трапляюцца лясныя масівы.

ЕРЗІКАЎ Фёдар Пятровіч (30.5.1918, с. Архангельскае Ражскага пав. Разанскай губ.— 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1941, камандзір артыл. батарэі. Вызначыўся каля Віцебска 25—27.6. 1944 пры ліквідацыі акружанай групоўкі праціўніка. Загінуў у баі.

ЕРМАКОВІЧ Лаўрын Пятровіч [7(19).8.1896, в. Лютавічы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 9. 1.1956], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. танк. войск (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1938), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1941). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з чэрв. 1919. З 1920 на Зах. фронце — камандзір узвода. З 1921 у войсках Зах. і Бел. ваен. акруг. У Айч. вайну на Карэльскім фронце — нач. аддзела аўтабранятанкавых войск аператыўнай групы, камандуючы бранятанкавых і механізаваных войск арміі і фронту. З 1944 у цэнтр. апараце Мін-ва абароны. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ЕРМАКОЎ Фрол Андрэевіч [15(28).8.1915, в. Несцераўка Казельскага пав. Калужскай губ.— 18.10.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). У Чырв. Арміі з 1937. Вызначыўся пры вызваленні Гомельшчыны. Ноччу 17—18.10.1943 узвод на чале з Е. фарсіраваў Дняпро на Пд ад Лоева, каля в. Бывалькі адбіў тры варожыя контратакі. Загінуў у баі. Пахаваны ў Бывальках.

ЕРМАЛАВІЧЫ, вёска ў Вішоўскім с/с Бялыніцкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Фрунзе. За 24 *км* на У ад Бялыніч, 20 *км* ад Магілёва, на шашы Мінск — Магілёў. 492 ж., двароў 143 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1944 вёску спалілі нямец.-фаш. захопнікі, загубілі 29 мірных жыхароў.

ЕРМАЛАЕВА Лізавета Аляксандраўна (н. 2.4.1930, г. Ворсма Паўлаўскага р-на Ніжагародскага краю), беларуская савецкая спартсменка, майстар спорту СССР (1957) па лёгкай атлетыцы. У 1955 скончыла Бел. дзярж. ін-т фіз. культуры. Чэмпіёнка Еўропы па бегу на 800 *м* (1958). Чэмпіёнка СССР па бегу на 800 *м* (1957, 1958) і кросе на 2000 *м* (1957, 1959). Чэмпіёнка Усв. універсіяды студэнтаў у Парыжы (1957). Пераможца кросу на прыз газеты «Юманітэ» (1958, Парыж), першага матча СССР — ЗША (1958), матча СССР — ФРГ (1958 па бегу на 800 *м*), матча СССР — Англія ў эстафеце 3×800 *м* (1957). Працуе трэнерам-выкладчыкам па лёгкай атлетыцы ў дзіцяча-юнацкай спарт. школе добраахвотнага спарт. т-ва «Спартак» (Мінск).

ЕРМАЛАЕЎ Аляксей Мікалаевіч [н. 10(23). 2.1910, Пецярбург], рускі і беларускі балет-майстар, артыст балета і педагог. Нар. арт. СССР (1970). Пасля заканчэння Ленінградскага харэагр. вучылішча (1926) саліст Т-ра оперы і балета імя Кірава, з 1930 Вял. т-ра СССР. З роляў: Базыль («Дон Кіхот» Л. Мінкуса), Філіп («Полымя Парыжа» Б. Асаф'ева), Тыбальд («Рамэо і Джульета» С. Пракоф'ева), Лі Шанфу («Чырвоны мак» Р. Гліэра). Наватарства Е. выявілася перш-наперш у сцвярджэнні мужчынскага гераічнага танца ў сав. балеце. Сааўтар сцэнарыя і пастаноўшчык першага бел. нац. балета «Салавей» М. Крошнера (1-я рэд. з Ф. Лапуховым, 1939, 2-я аднаго Е., 1940), дзе дасягнуў арган. сінтэзу пар. і класічнага танца. Стварыў сцэнарыі і паставіў па бел. сцэне балеты «Аповесць пра каханне» (1953) і «Палымяныя сэрцы» (1955) на музыку балета В. Залатарова «Князь-возера». З 1961 педагог Маск. харэагр. вучылішча (маст. кіраўнік з 1969) і балетмайстар-рэпетытар Вял. т-ра СССР. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1947, 1950. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Літ.: Алексей Николаевич Ермолаев. М., 1956; Чурко Ю. Белорусский балет. Мн., 1966.

Ю. М. Чурко. Мінск.

ЕРМАЛАЕЎ Рыгор Дзмітрыевіч (1924, г. Пакроўск АССР немцаў Паволжа — 25.6. 1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў Бешанковіцкім р-не Віцебскай вобл. 25.6.1944 экіпаж танка Е. захапіў пераправу цераз Зах. Дзвіну і вёў бой з ворагам да падыходу сав. войск. Загінуў у гэтым баі.

ЕРМАЛАЕЎ Феаген Піліпавіч [14.1.1920, в. Агнёўка Бійскай акр. Алтайскай губ.— 9. 10.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. пры фарсіраванні Дняпра, Басі і Проні. У чэрв. 1944 батальён пад камандаваннем Е. пераправіўся цераз Дняпро, выбіў ворага з траншэй, замацаваўся на плацдарме, перарэзаў шашу Мінск — Магілёў, захапіў і знішчыў 500 аўтамашын праціўніка з ваен. грузам. Загінуў у баі пры вызваленні Польшчы.

ЕРМАЧОК Мацвей Лук'янавіч [н. 18(31).10. 1903, в. Доўгая Слонімскага пав. Гродзенскай губ.], удзельнік грамадз. вайны, геп.-м. танк. войск (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1921. Скончыў Ваен. бранятанкавую акадэмію (1938). У Чырв. Арміі з 1920. У грамадз. вайну ўдзельнічаў у барацьбе з бандытызмам у Екацярынбургскім пав. У Айч. вайну на Зах., Цэнтр., 2-м і 3-м Укр. франтах — камандзір брыгады, нам. камандзіра корпуса. У 1945—56 на камандных пасадзе, нач. вучылішча. З 1956 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Кіеве.

ЕРМАШКЕВІЧ Барыс Кірыкавіч [н. 18.4 (1.5).1907, в. Рыскава Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ.], генерал-лейтэнант (1966). З сялян. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Полацкі лясны тэхнікум (1929), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1948). У Чырв. Арміі з 1935. У Айч. вайну на Зах., 2-м Бел. франтах — у штабах арміі і фронту. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Польшчы, баёў за Кёнігсберг. У 1944—55 на адказных пасадах у штабах Паўн. групы войск, ваен. акруг. З 1955 у цэнтр. апараце Мін-ва абароны СССР. Узнаг. 9 ордэнамі, медалямі, ордэнам ПНР.



ЕРХІ, вёска ў Касцяневіцкім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 22 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 125 *км* ад Мінска, 14,5 *км* ад чыг. ст. Княгініна. 209 ж., двароў 69 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік 24 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕРЭВАН (б. Эрывань), горад, сталіца Арменскай ССР, адзін з буйных прамысл. і культ. цэнтраў СССР. На р. Раздан (прыток Аракса), на пахіленай Араратскай раўніне на выш. 900—1300 *м* над узр. м. Чыг. станцыя, вузел аўтамаб. дарог, аэрапорт. 767 тыс. ж. (1970).

Упершыню ўпамінаецца ў 7 ст. Урарцкі надпіс, выяўлены пры раскопках, сведчыць, што ў 782 да н. э. на месцы Е. была крэпасць Эрэбуні. З сярэдзіны 13 ст. расце яго эканам. і паліт. значэнне. З 1440 адм. цэнтр Усх. Арменіі, з 1500 крэпасць, якую няраз захопліваді і разбуралі персы і туркі. З 1735 цэнтр Ерэванскага ханства ў складзе Персіі. У выніку рус.-персідскай вайны 1826—28 далучаны да Расіі. З 1828 цэнтр Армянскай вобл., з 1840 павятовы горад, з 1849 цэнтр Эрыванскай губ. У 1901 чыгунка злучыла Е. з Тыфлісам, у 1908 з Джульфою, што паскорыла эканам. развіццё горада. С.-д. рух узнік у пач. 20 ст., у 1903—05 афармілася бальшавіцкая арг-цыя. Працоўныя Е. ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905—07. У маі 1918 уладу ў Е. пры падтрымцы замежных інтэрвентаў захапіла бурж.-нацыяналіст. партыя Дашнакцуюн. У вер. 1919 у Е. нелегальна выбраны Армянскі к-т РКП(б), пад кіраўніцтвам якога працоўныя Арменіі з дапамогай Чырв. Арміі скінулі дыктатуру дашнакаў і 29.11.1920 устанавілі Сав. уладу. Е. стаў сталіцай Арм. ССР. У лют. 1921 дашнакі з дапамогаю Турцыі ўзняліі контррэвалюц. мяцеж і захапілі Е. 2.4.1921 мяцеж ліквідаваны і канчаткова ўсталявана Сав. улада.


Гал. галіны прамысловасці: машынабудаванне, хім., электратэхн., каляровая металургія, харч., лёгкая. На долю Е. прыпадае $^1/_5$ усіх машын і прылад, якія выпускае рэспубліка. Найбольшыя з-ды: Армэлектразавод імя Леніна, электралямпавы, кабельны, прыладабудаўнічы, дакладных электраприлад, гадзіннікавы, станкабудаўнічы імя Дзяржынскага, кампрэсарны. Вытворчасць лічыльных, лічыльна-матэм. машын, аўтакараў, аўтапагрузчыкаў, абсталявання для хім. прадпрыемстваў. Хім. з-ды: імя Кірава (выпускае сінт. каўчук, ацэтылен), «Палівінілацэтат», аўтамабільных шын. Алюмініевы з-д, мармураапрацоўчы камбінат. Вытворчасць электравогнетрывалых матэрыялаў для чорнай металургіі, буд. матэрыялаў (розныя віды туфу), жалезабетону, зборных дэталяў і канструкцый. Руднік здабычы спажыўной солі. Харчасмакавая прамысловасць (каньячны, вінаробны, кансервавы з-ды, масла-тлушчакамбінат, мяса- і млынкамбінаты, кандытарская, тытунёвая ф-кі). Лёгкая прамысловасць выпускае трыкатажныя вырабы, шаўк. тканіны, абутак, дываны, бытавыя і галантарэйныя вырабы з пластыку.

У 1970/71 навуч. г. ў Е. было: 171 агульнаадук. школа ўсіх тыпаў, 237 дашкольных дзіцячых устаноў, 24 сярэднія спец. навуч. ўстановы, 11 ВНУ: *Ерэванскі універсітэт*, політэхн., зоаветэрынарны, мед., Армянскі с.-г., Армянскі пед., пед. ін-т рус. і замежных моў, Армянскі дзярж. ін-т фіз. культуры, Дзярж. кансерваторыя, філіял Маск. каап. ін-та, Дзярж. мастацка-тэатральны ін-т. У Е. (1971): *Акадэмія навук Армянскай ССР*, тэатры (оперы і балета імя Спендыярава, драматычны імя Сундукяна, Рускі драм. тэатр імя Станіслаўскага, Ерэванскі драм. тэатр, муз. камедыі імя Параняна, юнага гледача імя Мікаяна, лялек імя Туманяна, Ерэванскі азерб. міжраённы тэатр імя Джабарлы), філармонія, 69 клубных устаноў, 15 музеяў, 107 б-к, Ерэванскі Матэнадаран імя Месропа Маштоца (сховішча стараж. рукапісаў), Ерэванскі тэлецэнтр (з 1956). Гарадская газ. «Ёрекоян Ереван» («Вячэрні Ерэван»), выд. з 1957.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Е. было 75 бальнічных ложкаў. На пач. 1970 працавалі 22 бальніцы (у т. л. 8 гарадскіх, 5 дзіцячых, 3 радзільныя дамы, 6 стацыянараў НДІ) на 7200 ложкаў (каля 10 ложкаў на 1 тыс. ж.), 35 паліклінік (апроч 5 стаматалагічных), 11 дыспансераў, 3 мед. сан. часткі, 136 пунктаў аховы здароўя (у т. л. 62 урачэбныя), 7 сан.-эпідэміялагічных станцый, 3855 урачоў, 7370 чал. сярэдняга мед. персаналу, 2 дзіцячыя санаторыі на 375 ложкаў, мед. ін-т, ін-т удасканалення ўрачоў.

На тэр. Е. асталіся руіны крэпасці Эрэбуні і пабудоў 8—5 ст. да н. э. Помнікі сярэдневякоўя: ц. Катогіке (13 ст.) і Заравар (17 ст.). Збераглісяарыгінальныя жылыя дамы 18—19 ст. У сав. час буд-ва і рэканструкцыя вяліся паводле 1-га генплана (1924, А. Таманян). У цэнтры Е. ансамбль плошчы імя Леніна з Домам урада (1926—41, Таманян) і інш. адм. будынкамі з розначаляровага туфу. Сярод значных збудаванняў: т-р оперы і балета імя Спендыярава (1926—53, Таманян), Матэнадаран (1959, М. Грыгаран), Вял. Разданскі мост (1951—55, Г. Агабабян), гал. будынак АН Арм. ССР (1959, С. Сафаран), драм. т-р імя Сундукяна (1966, Р. Алавердзян). Помнікі: У. І. Леніну (1940,

Ерэван. «Лебядзінае возера» на вуліцы Туманяна.



скульпт. С. Мяркураў), Давіду Сасунскаму (1959, Е. Качар), Саят-Наве (1963, А. Арцюнян) і інш. У 60-я г. пракладзены новыя вуліцы, будуюцца 9—14-павярховыя дамы. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Армянская ССР і Архітэктура.*

Літ.: Симонян А. П. Ереван. Очерк истории, экономики и культуры города, 2 изд., Ереван, 1965; Ереван — 2750, Ереван, 1968.

А. П. Сіманян (гістар. нарыс, гаспадарка), *А. Егікян* (ахова здароўя). Ерэван.

ЕРЭВА́НСКІ УНІВЕРСІТЭ́Т, вышэйшая навучальная ўстанова, засн. ў 1920 як народны ун-т з двума ф-тамі — грамадскіх навук і прыродазнаўчых навук. У 1923 ператвораны ў дзярж. ун-т. Ф-ты ў 1970/71 навуч. г.: механіка-матэм., фіз., хім., біял., філал., гістар., юрыд., эканам., эканомікі гандлю і тавараznаўства, геагр., геалагічны, усходазнаўства. Навучанне дзённае, вячэрняе і завочнае; ёсць аспірантура. Пры ун-це вылічальны цэнтр, н.-д. і праблемныя лабараторыі, абсерваторыя, б-ка. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па фізіка-матэм., хім., біял., філал., гістар., юрыд., філас., эканам., геал. і геагр. навуках. Выдае «Веснік», «Вучоныя запіскі» і інш. перыяд. выданні.

С. Т. Ахумян. Ерэван.

ЕСЕ́І (эсены), члены апазіцыйнай грамадска-рэлігійнай секты ў Іудзеі (2 ст. да н. э.— 1 ст. н. э.), якая папярэднічала хрысціянству.

Паводле сведчанняў ант. аўтараў, Е. жылі асобнымі калектывамі, мелі агульную маёмасць, разам працавалі. У адрозненне ад афіц. іудаізму адмаўляліся прызнаваць ахвярапрынашэнне, карысталіся асобным календаром, увялі новыя рытуальныя абрады і інш. У форме есейства выяўляўся пасіўны пратэст нар. мас супраць унутраных і знешніх прыгнятальнікаў.

Літ.: Лившиц Г. М. Происхождение христианства в свете рукописей Мертвого моря, Мн., 1967; Амусин И. Д. Рукописи Мертвого моря, М., 1960.

ЕСЕ́НСКІ (Jesenský) Янка (30.12.1874, г. Марцін — 27.12.1945), славацкі пісьменнік. Нар. мастак Чэхаславакіі (1945). З сям'і адваката. Па адукацыі юрыст. Першы зб. «Вершы» (1905). Аўтар кн. «Правінцыяльныя апавяданні» (1913), «Са старых часоў» (1935), рамана «Дэмакраты» (т. 1—2, 1934—37), у якіх сатырычна выкрываюцца мараль і норавы бурж. грамадства. Антыфаш. вершы, напісаныя ў час гітлераўскай акупацыі, у зб. «Надзённае» (1945), «Супраць ночы» (1945), «Чорныя дні» (1945). На творчасць Е.— вяршыню крытычнага рэалізму ў славацкай л-ры — паўплывалі рус. пісьменнікі М. Гогаль, І. Ганчароў, А. Чэхаў. Перакладаў творы А. Пушкіна, М. Лермантава, С. Ясеніна, А. Блока.

Тв.: Рус. пер.— Демократы, М., 1957; Провинциальные рассказы, М., 1958.

ЕСЕНТУ́КІ, бальнеалагічны курорт у Стаўрапольскім краі РСФСР. За 43 *км* ад ст. Мінеральныя Воды, за 17 *км* ад Пяцігорска. Размешчаны Е. на выш. 600—640 *м* над узр. м. Клімат горна-стэпавы. Цёплае лета і восень. Сярэднегадавая т-ра 8,1 °С. Сонечна 1825 гадзін у год. Больш за 20 мінер. крыніц. Мінеральныя, вуглякіслыя, гідракарбанатна-хларыдна-натрыевыя і сульфатна-гідракарбанатна-кальцыева-магніевыя воды выкарыстоўваюцца для піцця. Вада нарзанаў Гааза-Панамароўскай крыніцы і грязь Тамбуканскага возера ўжываюцца для ваннаў. На курорце санаторыі, грязелячэбніца, паліклініка. Лечаць ад хвароб органаў стрававання, перв. сістэмы, сардэчна-сасудзістых хвароб, парушэнняў абмену рачываў, гінекалагічных хвароб. Сезон увесь год.

Літ.: Здравницы профсоюзов СССР, М., 1967; Вишневский А., Ходыкин А. и Коновалов И. Курорт Ессентуки, Ставрополь, 1965.

ЕСПЕРСЕ́Н (Jespersen) Кнуд (н. 12.4.1926, мяст. Скульстэдэ), дзеяч дацкага рабочага руху. З рабочых. У перыяд акупацыі Даніі ням. войскамі (1940—45) удзельнічаў у Руху Супраціўлення. З 1942 чл. Камуніст. партыі Даніі (КПД). У сак. 1945 арыштаваны гестапа. Пасля вызвалення Даніі ад акупацыі на прафсаюзнай рабоце. У 1951 выбраны старшынёй Паўночнаютландскай абласной арг-цыі КПД, з 1952 чл. ЦК, з ліст. 1958 старшыня КПД. Узначальваў дэлегацыі КПД на XXI—XXIV з'ездах КПСС, на Нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве ў 1960 і 1969.

ЕСПЕРСЕ́Н (Jespersen) Ота (16.7.1860—30.4.1943), дацкі моваznавец. Праф. Капенгагенскага ун-та (1893—1925). Англіст, фанетыст, даследчык методыкі выкладання замежных моў. Поглядамі блізкі да *младаграматыкаў.* Найважнейшыя працы: «Развіццё і структура англійскай мовы» (1905); «Падручнік фанетыкі» (1904); «Мова, яе прырода, развіццё і паходжанне» (1922); «Сучасная англійская граматыка ў гістарычным асвятленні» (т. 1—7, 1909—49); «Філасофія граматыкі» (1924, рус. пер. 1958).

Літ.: Отто Есперсен. Бнобиблиогр. указатель, М., 1963.

ЕЎДАКІ́МАВІЧЫ, вёска ў Заходскім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Арціслаўка. Цэнтр калгаса імя Андрэева. За 32,5 *км* на ПдУ ад Шклова, 27,5 *км* ад Магілёва, 34,5 *км* ад чыг. ст. Шклоў, на шашы Ленінград — Адэса. 412 ж., двароў 146 (1971). Лесапільня, млын, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны. У кастр. 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 30 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны і мемарыяльная дошка на ўшанаванне іх памяці.

ЕЎДАКІ́МАЎ Аляксей Пятровіч (8.2.1925, Трупяеўка Клінскага пав. Маскоўскай губ.— 6.10.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1943. Вызначыўся на Пд ад Лоева Гомельскай вобл. ў кастр. 1943. Адзін з першых пераправіўся цераз Дняпро і адбіваў варожыя атакі. Загінуў у баі за в. Глушэц Лоеўскага р-на. Пахаваны ў в. Дзяржкавы Лоеўскага р-на.

ЕЎДАКІ́МАЎ Віктар Васілевіч [14(27).8.1911, Екацярынадар — 20.9.1945], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1934. Лётчык, падпалкоўнік Е. вызначыўся ў час вызвалення Беларусі. Зрабіў 231 баявы вылет. Памёр ад ран. Пахаваны ў Ваўкавыску Гродзенскай вобл.

ЕЎДАШЭ́НКА Сяргей Іванавіч (н. 6.7.1929, Адэса), рускі савецкі акцёр. Засл. арт. БССР (1963). Пасля заканчэння Адэскага тэатр. вучылішча (1950) працаваў у т-рах Адэсы і Львова. З 1955 акцёр, з 1970 рэж. Брэсцкага т-ра імя ЛКСМБ. Выконвае вострахарактарныя, камед. і драм. ролі. Асабліва вызначыўся ў сучасным рэпертуары. З роляў: Вядучы («Іркуцкая гісторыя» А. Арбузава), Чайка («Кухарка» А. Сафронава), Баўман («Грак — птушка вясновая» С. Мсціслаўскага), Забелін («Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна), Ермашоў («Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча), Вадзім («Чатыры крыжы» А. Дзялендзіка), Яраш («Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна). Паставіў спектаклі: «Брыганціна» В. Карастылёва (1966), «Валыншчык з Страканіц» І. Тыла (1968), «Лейтэнанты» А. Пінчука (1969) і інш.

ЕЎКЛІ́Д (Eukleidēs; 3 ст. да н. э.), стараж.-грэч. матэматык. Аўтар першага з вядомых тэарэт. трактатаў па матэматыцы, а таксама прац па астраноміі, оптыцы, музыцы. Гал. праца — «Асновы» (у латынізаванай форме — «Элементы»), у якой ён падвёў вынік папярэдняму развіццю грэч. матэматыкі і стварыў фундамент для далейшых матэм. даследаванняў. «Асновы» маюць раздзелы: элементарнай геаметрыі *(еўклідавай геаметрыі),* тэорыі лікаў, алгебры, элементаў тэорыі граніц, тэорыі вымярэння геам. велічынь.

Літ.: Ван дер Варден Б. Л. Пробуждающаяся наука. Математика Древнего Египта, Вавилона и Греции, пер. с гол., М., 1959.

ЕЎКЛІ́ДАВА ГЕАМЕ́ТРЫЯ, геаметрыя, аснову якой складаюць аксіёмы абсалютнай геаметрыі і аксіёма Еўкліда аб паралельных прамых. Упершыню яе сістэматычную пабудову даў *Еўклід* на аснове некаторай сістэмы аксіём.

Асн. аксіёма — аксіёма аб паралельных прамых (існуе толькі адна прамая, якая паралельна дадзенай і праходзіць праз зададзены пункт). Тэарэмы, дзе не выкарыстоўваецца аксіёма Еўкліда аб паралельных, складаюць абсалютную геаметрыю. Змена аксіёмы Еўкліда аб паралельных прамых прыводзіць да *нееўклідавых геаметрый* (гл. *Лабачэўскага геаметрыя, Рымана геаметрыя*). Е. г. апісвае ўласцівасці фіз. прасторы класічнай механікі. Гл. таксама *Геаметрыя.*

Літ.: Ефимов Н. В. Высшая геометрия, 4 изд., М., 1961.

ЕЎЛАШО́ЎСКІ Фёдар (7.2.1546, Ляхавічы Віленскага ваяв.— 1604), беларускі грамадскі дзеяч і пісьменнік. З дробнамаянткавай шляхты. Самаадукацыяй набыў шырокія веды па юрыспрудэнцыі, філасофіі, справаводстве. Служыў «падсудкам» (адвакатам) у Навагрудку, карыстаўся вял. папулярнасцю. Па даручэнні навагрудскай шляхты ў 1579 быў павятовым паслом на варшаўскім вальным сейме. У рэліг. пытаннях быў верацярпімы; у поглядах на тагачаснае грамадска-паліт. жыццё трымаўся памяркоўнага лібералізму. З літ. спадчыны пакінуў «Дзённік» (апубл. 1886), у якім храналагічна (1564—1604) падаў каларытныя бытавыя малюнкі жыцця бел. і польскай шляхты, адзеркаў феадалаў з бяспраўнага народу. У «Дзённіку» спалучаны традыцыі афіц. летапісання з асабістымі дзённікавымі запісамі, мова насычана паланізмамі. Гл. *«Дзённік» Фёдара Еўлашоўскага.*

Тв.: [Урыўкі з Дзённіка Еўлашоўскага], у кн.: Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры, Мн., 1959.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 254—260.

М. Р. Ларчанка. Мінск.

ЕЎЛАШЫ, вёска ў Лядскім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Спушанка. Цэнтр калгаса імя Чапаева. За 13 *км* на ПнЗ ад Шчучына, 55 *км* ад Гродна, 20 *км* ад чыг. ст. Ражанка. 236 ж., гасп. 71 (1971). Швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 7 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЕЎЛАШЭ́ЎСКІ Казімір Людвік (г. н. невяд.— сак. 1664), дзярж. дзеяч Вял. кн. Літ. З 1655 канцлер смаленскі, з 1659 ваявода брэст-літоўскі, сакратар караля Зыгмунта III Вазы. У 1658 схіліў укр. гетмана І. Выгоўскага да здрады і заключэння Гадзяцкага дагавору, паводле якога Украіна адыходзіла да Рэчы Паспалітай. Гэта выклікала паўстанне ўкр. народа і аднаўленне руска-польскай вайны 1654—67. *У. У. Грамовіч.* Мінск.

ЕЎПАТО́РЫЯ, кліматычны прыморскі і грязевы курорт на беразе Чорнага м. ў Крымскай вобл. За 79 *км* ад Сімферопаля, 155 *км* ад Ялты.

Клімат Е. прыморска-стэпавы. Гарачае, сухое і сонечнае лета, мяккая зіма. Сярэднегадавая т-ра 11,5 °С, у летні перыяд (май — вер.) 24 °С. Сонечна 2485 гадзін у год. Асн. лекавыя фактары: клімат, марскія купанні, выкарыстоўваюцца лекавая грязь Майнакскага возера, хларыдна-натрыевыя воды (для ваннаў і пітнога лячэння). Пясчаны (залаты) пляж, дамы адпачынку, санаторыі, пансіянаты, грязелячэбніца. Курорт пераважна для дзяцей. Лечаць: ад касцявога туберкулёзу, ускладненняў поліяміэліту і рахіту, ад хвароб органаў руху і перыферычнай перв. сістэмы, ад гінекалагічных хвароб. Сезон увесь год.

Літ.: Здравницы профсоюзов СССР, М., 1967; Григорьев Н. Н. и Русанов А. Ф. Крым курортный, Симферополь, 1968.

ЕЎРАБАЧА́ННЕ, міжнар. аб'яднанне для абмену тэлевізійнымі перадачамі; састаўная частка *Еўрапейскага саюза радыёвяшчання і тэлебачання.*

Аб'ядноўвае тэлевізійныя арг-цыі Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Бельгіі, Даніі, Італіі, Ірландыі, Нарвегіі, Нідэрландаў, Фінляндыі, Францыі, ФРГ, Швейцарыі і інш. еўрап. краін. Тэлевізійныя арг-цыі краін Паўн. Еўропы, акрамя таго, уваходзяць (у рамках Е.) у склад тэлевізійнага аб'яднання Нордбачанне. Е. трымае сувязь з усімі арг-цыямі *Інтэрбачання* па пытаннях абмену тэлевізійнымі праграмамі, фільмамі і актуальнай хронікай, а таксама сумеснай арганізацыі непасрэдных міжнар. трансляцый з месцаў важных культурна-паліт., спарт. і інш. падзей. Цэнтр Е.— Брусель (Бельгія). *М. Ф. Дубянецкі.* Мінск.

ЕЎРАПЕ́ЙСКАЕ АБ'ЯДНА́ННЕ ВУГАЛЮ І СТА́ЛІ (ЕАВС), адно з найбуйнейшых міжнар. дзярж.-манапал. аб'яднанняў. Створана на аснове «плана Шумана» для ўмацавання ваенна-металург. базы НАТО ў Зах. Еўропе.

Дагавор аб стварэнні набыў сілу ў ліп. 1952. Уваходзяць: ФРГ, Францыя, Італія, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург. Пад наглядам аб'яднання ўсе падраздзяленні металург., вугальнай і жалезарудnай прамысловасці краін-удзельніц. Кантралюе 70% выплаўкі сталі, палову здабычы кам. вугалю і жал. руды ў Зах. Еўропе. З 1953—54 у межах краін — удзельніц ЕАВС уведзены агульны рынак вугалю і сталі. Дзейнасць аб'яднання, як і *Еўрапейскага эканамічнага таварыства* і *Еўрапейскага таварыства па атамнай энергіі,* знаходзіцца пад уплывам паліт. планаў імперыял. дзяржаў, якія стварацюць у Зах. Еўропе ваенна-эканам. блок.

ЕЎРАПЕЙСКАЕ ВАЛЮТНАЕ ПАГАДНЁННЕ (ЕВП), пагадненне капіталіст. краін Еўропы для рэгулявання валютных сувязей, каротк. катэрміновага крэдытавання і шматбаковых узаемных разлікаў. Набыло сілу (1959) з увядзеннем абарачальнасці асноўных заходнееўрапейскіх валют. Дзеянне пагаднення кантралюе *Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця.*

ЕЎРАПЕЙСКАЕ ТАВАРЫСТВА ПА АТАМНАЙ ЭНЕРГІІ (Еўратам), арганізацыя, створаная краінамі — удзельніцамі НАТО (ФРГ, Францыяй, Італіяй, Нідэрландамі, Бельгіяй, Люксембургам) для аб'яднання сваіх рэсурсаў атамнай энергіі і атамнай прамысловасці. Дагавор аб стварэнні набыў сілу 1.1.1958.

Афіц. задача т-ва — забяспечыць хуткае развіццё ядз. прамысловасці. На самай справе большасць арганізатараў Еўратама разлічвала з дапамогаю т-ва паскорыць стварэнне атамнай зброі ў сваіх краінах. Паводле пагаднення 1958 у праграме Еўратама ўдзельнічаюць ЗША (буд-ва рэактараў, паставка урану-235, правядзенне даследаванняў). Пагадненне дае магчымасць манаполіям ЗША замацоўваць за сабою рынак атамнага абсталявання краін — удзельніц Еўратама. На сярэдзіну 1969 у гэтых краінах было 146 дзейных аб'ектаў атамнай прамысловасці. Арганізацыйна Еўратам непасрэдна звязаны з *Еўрапейскім эканамічным таварыствам* і *Еўрапейскім аб'яднаннем вугалю і сталі.*

ЕЎРАПЕЙСКАЕ ЭКАНАМІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА (ЕЭТ), «Агульны рынак», міжнар. дзярж.-манапаліст. аб'яднанне. Краіны-ўдзельніцы: ФРГ, Францыя, Італія, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург. З ЕЭТ асацыіруюцца некат. афр. краіны (гл. *«Еўрафрыка»*). Дагавор аб стварэнні ЕЭТ набыў сілу 1.1.1958.

Афіц. задачы т-ва: абмежаванне эканам. палітыкі краін-удзельніц праз ліквідацыю гандл. бар'ераў, устанаўленне свабоднага руху капіталаў, адзінага таможнага тарыфу ў знешнім гандлі з інш. краінамі, правядзенне ўзгодненай палітыкі па пытаннях с. гасп., транспарту, перамяшчэння рабочай сілы і г. д. Па сутнасці ЕЭТ, створанае пры садзеянні ЗША,— саюз імперыял. краін з палітычнымі мэтамі, эканам. база агрэс. блоку НАТО. У адносінах да СССР і інш. сацыяліст. краін ажыццяўляе палітыку адкрытай дыскрымінацыі эканам. сувязей, а ў адносінах да краін, якія сталі на шлях незалежнага развіцця,— палітыку неакаланіялізму.

Асн. органы: Асамблея, Савет, Камісія і Суд — з 1967 адначасова з'яўляюцца органамі *Еўрапейскага таварыства па атамнай энергіі* і *Еўрапейскага аб'яднання вугалю і сталі*, што азначае новую ступень у інтэграцыі капіталіст. краін (гл. *Інтэграцыя эканамічная*). Аднак стварэнне ЕЭТ не аслабіла супярэчнасцей паміж капіталіст. дзяржавамі, барацьба ідзе як унутры ЕЭТ, так і паміж аб'яднаннямі капіталістычных краін.

Літ.: Экономические группировки в Западной Европе, М., 1969; Экономические проблемы «Общего рынка», М., 1962; Мировая экономика, 2 изд., М., 1969; Чепраков В. А. «Общий рынок» — новый «священный союз» монополий, М., 1963.

П. І. Нескаромны. Мінск.

ЕЎРАПЕЙСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ СВАБОДНАГА ГАНДЛЮ (ЕАСГ), гандлёва-эканам. аб'яднанне заходнееўрап. краін. Створана ў 1960 у процівагу Еўрапейскаму эканамічнаму таварыству. Уваходзяць: Вялікабрытанія, Швецыя, Нарвегія, Данія, Швейцарыя, Аўстрыя, Партугалія, а таксама Ісландыя (з 1970). З 1961 з ЕАСГ асацыіруецца Фінляндыя. Прадугледжвае стварэнне «свабоднага рынку» праз паступ. адмену таможных пошлін у гандлі паміж краінамі-ўдзельніцамі. Стварэнне ЕАСГ сведчыць пра барацьбу капіталіст. дзяржаў за сферы ўплыву.

Літ.: Гл. пры арт. *Еўрапейскае эканамічнае таварыства.*

П. І. Нескаромны. Мінск.

ЕЎРАПЕЙСКІ САВЕТ, міжнародная палітарганізацыя капіталістычных краін кансультатыўнага характару, у якую ўваходзяць (на 1969) Вялікабрытанія, Францыя, ФРГ, Італія, Бельгія, Нідэрланды, Люксембург, Данія, Нарвегія, Швецыя, Ісландыя, Ірландыя, Мальта. Створана ў 1949 (Лондан). Кіруючыя органы ў Страсбурзе (Францыя). Паводле статута мэта Е. с.— забяспечваць адзінства краін — удзельніц савета для абароны і ажыццяўлення агульных прынцыпаў і ідэалаў, а таксама спрыяць эканам. і сац. прагрэсу гэтых краін. Фактычна дзейнасць Е. с. накіравана на падтрымку «халоднай вайны» і агрэс. кірунку *Арганізацыі паўночнаатлантычнага дагавору* (НАТО).

ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ РАДЫЁВЯШЧАННЯ І ТЭЛЕБАЧАННЯ, міжнар. радыётэлевізійнае аб'яднанне.

Заснаваны ў 1925. Аб'ядноўвае радыётэлевізійныя арг-цыі ўсіх краін Зах. Еўропы. На правах правадзейных чл. у аб'яднанне ўваходзяць радыётэлевізійныя арг-цыі Ізраіля, Лівана, Туніса, Турцыі. Мае шырокую сетку т. зв. асацыіраваных членаў з радыётэлевізійных арг-цый Аўстраліі, Бразіліі, Ганы, ЗША, Канады, Марока, Новай Зеландыі, Пакістана, Цэйлона, Японіі і іншых краін. Вышэйшы орган аб'яднання — Ген. асамблея, выкончы — Адм. савет. Цэнтры аб'яднання — Жэнева (Швейцарыя) і Брусель (Бельгія), у якім выходзіцца і цэнтр міжнар. аб'яднання тэлевізійных арг-цый еўрап. краін *Еўрабачанне.*

Літ.: Международные неправительственные организации. Справочник, М., 1967.

М. Ф. Дубянецкі. Мінск

ЕЎРАПЕІДНАЯ РАСА (еўразійская), адна з асноўных або вялікіх рас чалавецтва (каля 40% насельніцтва), у якую ўваходзяць беламорска-балтыйская, атланта-балтыйская, сярэднееўрапейская, балкана-каўказская і інда-міжземнаморская малыя расы.

У прадстаўнікоў Е. р. скура ад светлых да смуглых адценняў, вочы ад вельмі светлых да вельмі цёмных, валасы мяккія роўныя або хвалістыя, светлыя і цёмныя; прыкметна расце барада, выступае нос з высокім пераноссем, адносна тонкія губы, рост ад нізкага да высокага. Е. р. пашырана ў Еўропе, Пярэдняй і Сярэдняй Азіі, Паўн. Афрыцы, Індастане, змяшанае з інш. расамі — у Аўстраліі, Паўн. і Паўд. Амерыцы, на Пд Сібіры і Пд Афрыкі. Беларусы належаць да беламорска-балтыйскай малой расы, на Пд Беларусі жывуць прадстаўнікі сярэднееўрапейскай расы. Іл. гл. ва ўкл. да арт. *Расы.*

Літ.: Быховский А. Расы и происхождение человека, М., 1934; Проблемы эволюции человека и его рас, М., 1968.

А. І. Мікуліч. Мінск.

ЕЎРАТАМ, гл. *Еўрапейскае таварыства па атамнай энергіі.*

«ЕЎРАФРЫКА», імперыялістычная канцэпцыя палітычнага і эканамічнага аб'яднання краін Зах. Еўропы і Афрыкі пад эгідай і дзеля інтарэсаў заходнееўрапейскага капіталу. Адлюстроўвае імкненне імперыялізму да калектыўных формаў неакаланіяльнага панавання, з'яўляецца сродкам замацавання нераўнапраўнага становішча афр. краін у сусв. капіталіст. гаспадарцы, захавання і пашырэння палітычнага, эканам. і стратэгічных пазіцый імперыялізму ў Афрыцы.

Канвенцыі аб «асацыяцыі» афрыканскіх краін з *Еўрапейскім эканамічным таварыствам* падпісаны ў 1957, 1963 і 1969 (Берег Слановай Косці, Бурундзі, Верхняя Вольта, Габон, Дагамея, Дэмакр. Рэспубліка Конга, Камерун, Малагасійская Рэспубліка, Малі, Маўрытанія, Народная Рэспубліка Конга, Нігер, Руанда, Самалі, Сенегал, Тога, Цэнтральнаафрыканская Рэспубліка, Чад). Пад шырмай садзеяння эканам. развіццю гэтых краін капіталіст. дзяржавы шляхам фін.-эканам. замацавання, прэферэнцыяльнага гандл. рэжыму, свабоды перамяшчэння рабочай сілы і інш. мерапрыемстваў ставяць за мэту захаваць для сябе сферу выключнага ўплыву ў Афрыцы. Але іх дзеянні сутыкаюцца з невырашальнымі супярэчнасцямі паміж заходнееўрапейскімі манаполіямі і краінамі, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, паміж асобнымі імперыялістычнымі дзяржавамі Еўропы, паміж капіталіст. Еўропай і ЗША. Гл. таксама *Неакаланіялізм.*

Літ.: Скоров Г. Кому нужна Евразрика, М., 1957; Корендясов Е. Н. Коллективный колониализм в действии, М., 1969.

В. В. Гарбалюк. Мінск.

ЕЎРО́ПА (Euró̱pē), у старажытнагрэчаскай міфалогіі багіня земляробства; паводле найб. пашыранай рэдакцыі міфа — дачка фінікійскага цара Агенора, якую выкраў Зеўс, прыняўшы выгляд быка. Сюжэт пра выкраданне Е. выкарыстоўвалі майстры мастацтва (Тыцыян, В. Сяроў і інш.).

ЕЎРО́ПА (грэч. Euró̱pē ад семіцкага «ерэб», або «ірыб» — захад), частка свету на З Еўразійска-Азіяцкага мацерыка. Крайнія пункты кантынентальнай Е.: на Пн — мыс Нордкін 71°08′ паўн. ш., на Пд — мыс Маракі 36° паўн. ш., на З — мыс Рока 9°31′ зах. д., на У — Палярны Урал (паблізу Байдарацкай губы) 67°20′ усх. д. Граніца з Азіяй умоўная, праводзіцца па ўсх. падножжы Уральскіх гор, р. Эмбе, Каспійскім м. і Кума-Манычскай упадзіне. Абмываецца на Пн морамі Паўн. Ледавітага ак.— Карскім, Баранцавым, Белым, Нарвежскім, на З і Пд — Атлантычным ак. з морамі Балтыйскім, Паўночным, Біскайскім заліваў, Міжземным, Мрамарным, Чорным, Азоўскім морамі. Берагавая лінія вельмі парэзаная, даўж. яе каля 38 тыс. *км.* Плошча з а-вамі 10 млн. *км²* (а-вы каля 730 тыс. *км²*). Найб. п-вы: Кольскі, Скандынаўскі, Ютландыя, Пірэнейскі, Апенінскі, Балканскі, Крымскі; а-вы: Новая Зямля, Зямля Францыа-Іосіфа, Шпіцберген, Ісландыя, Брытанскія, Корсіка, Сардзінія, Сіцылія, Крыт. У Е. выдаляюць 2 буйныя часткі: Усх. Е. (Еўрапейская частка тэр. СССР) і Заходнюю (зарубежную) Е. У апошняй адрозніваюць Паўд. Е. (Пірэнейскі, Апенінскі, Балканскі п-вы і а-вы Міжземнага м.), Паўночную Е. (Скандынаўскі п-аў, Фінляндыя, Ісландыя), Сярэднюю Е. (астатнія раёны Зах. Е.). А-вы ў Паўн. Ледавітым ак., якія адносяцца да Е., утвараюць Еўрапейскі сектар Арктыкі. Карты гл. на ўкл.


Рэльеф. Па сярэдняй (каля 300 *м*) і максімальнай вышыні (г. Манблан — 4807 *м*) Е. ўступае іншым часткам свету, акрамя Аўстраліі. У будове паверхні Е. пераважаюць раўніны. Горы займаюць каля 17% яе тэр. Ніжэй узр. м. размешчаны ўзбярэжжа Каспійскага м. і некат. раёны ўзбярэжжа Балтыйскага і Паўн. мораў.


Палову плошчы Е. займае Усходне-Еўрапейская раўніна (Руская) і яе працяг на З — Сярэднееўрапейская раўніна з чаргаваннем узвышшаў да 300—400 *м* над узр. м. (Сярэднерускае, Прыволжскае, Валынскае, Падольскае, Валдайскае ўзв. і інш.) і нізін да 150—200 *м* (Прычарнаморская, Прыдняпроўская, Прыкаспійская і інш.). На У Усходне-Еўрапейская раўніна абмежавана стараж. горамі Урала (г. Нарадная — 1894 *м*), на Пд — Каўказскімі і Крымскімі (г. Раман-Кош — 1545 *м*) маладымі горамі, на ПдЗ — Карпатамі. На ПнЗ Е. стараж. Скандынаўскія горы (г. Гальхёпіген — 2469 *м*), зледзянелыя, разбітыя трэшчынамі, апрацаваныя стараж. ледавікамі. В-ў Ісландыя — базальтавае плато з вулканамі і ледавікамі. Зах. частка Е. перажыла гарыстан. Палоса невялікіх па плошчы і вышыні гор ахоплівае паўд. частку Сярэдняй Е. і Брытанскія а-вы: Цэнтральны масіў, Вагезы, Шварцвальд, Рэйнскія Сланцавыя горы, Рудныя, Судэты і інш. На Пд гэтая палоса абмежавана найб. высокімі ў Е. горамі Альпамі і Карпатамі, паміж якімі размешчаны Сярэднедунайская і Ніжнедунайская нізіны. У Паўд. Е. пераважае горны рэльеф: Пірэнеі, Андалузскія горы, Апенінны, Стара-Планіна, Дынара, Радопы, Пінд і інш.

Геалагічная будова. Адрозненні ў рэльефе абумоўліваюцца асаблівасцямі геал. будовы Е.: перавагай у ўсх. раўнінная частцы структур стараж. платформаў, у зах. частцы — складкавых структур розната ўзросту.


Усх. Е. занята Усходне-Еўрапейскай платформай з архейска-пратэразойскім фундаментам з дакембрыйскіх крышталічных і метамарфічных парод. Выступы фундамента на паверхні ўтвараюць Балтыйскі і Украінскі шчыты. У астатніх раёнах платформы фундамент перакрыты асадкавым чахлом розных магутнасці і ўзросту. На ПнЗ са стараж. платформай мяжуюць складкавыя каледонскія структуры (захад Скандынавіі, большая

Востраў Москенесё з групы Лафотэнскіх астравоў. Нарвегія (злева). Ладажскае возера. Карэльская АССР.









Сярэднедунайская раўніна. Венгрыя (злева). Стара-Планіна. Балгарыя.

ч. Брытанскіх а-воў, Шпіцберген); большая ч. Сярэдняй Е. занята герцынскімі складкавымі структурамі (поўдзень Ірландыі і Вялікабрытаніі, Цэнтр. масіў, Вагезы, Шварцвальд, Гарц, Цюрынгенскі Лес, Чэшскі Лес, цэнтр. раёны Пірэнейскага п-ва і інш.). У меза-кайназоі (асабліва ў неагене) на Пд і ў Сярэдняй Е. ўзніклі альпійскія складкавыя структуры (Пірэнеі, Альпы, Карпаты, Дынара, Апеніны, Стара-Планіна і інш.). Неагенавыя рухі ў выглядзе глыбавых падняццяў і апусканняў акраін і больш старажытных тэктанічных структур Е. У альпійскай зоне назіраюцца сучасныя тэктанічныя рухі, землетрасенні. Сучасны вулканізм распаўсюджаны ў Ісландыі (Гекла, Лакі) і Паўд. Е. (Везувій, Этна і інш.). У чацвярцічны перыяд у Е. нярэдка адбываліся абледзяненні (максімальнае дняпроўскае), якія акраілі Паўночную, часткова Сярэднюю Е., значныя раёны Усх. Е. і горныя вобласці. На некат. прыморскіх нізінах (Прыкаспійская і інш.) былі марскія трансгрэсіі.

Карысныя выкапні. Е. багата на карысныя выкапні: вялікія запасы каменнага вугалю (СССР, Польшча, Вялікабрытанія, ФРГ, Францыя), бурага вугалю (СССР, ГДР, ФРГ, Чэхаславакія, Польшча), нафты і газу (СССР, Румынія), газу (Нідэрланды), жал. руды (СССР, Швецыя, Францыя, Вялікабрытанія, Іспанія), свінцу і цынку (Польшча, Іспанія, Югаславія, Балгарыя), цынку (Італія, ФРГ), медзі (Іспанія, Югаславія, Фінляндыя, Швецыя, Нарвегія, Балгарыя), ртуці (СССР, Іспанія, Італія, Югаславія), спаляльнай і калійнай соляў (СССР, Польшча, ГДР, Францыя); значныя наклады баксітаў (СССР, Францыя, Югаславія, Венгрыя), апатытаў (СССР) і інш.

Клімат Е. абумоўлены размяшчэннем пераважна на ўмераным поясе, значным працягам з Пн на Пд і з З на У, актыўнай цыкланічнай дзейнасцю і пераважным заходнім пераносам паветр. мас. Сезонныя клімат. адрозненні залежаць ад паступлення сонечнай радыяцыі і ад дзеяння на яе размеркаванне цяпла і вільгаці паветр. патокаў агульнай цыркуляцыі атмасферы, якія звязаны з узаемадзеяннем Ісландскага мінімуму, Азорскага, Арктычнага і Азіяцкага максімумаў.

Т-ра найбольш цёплага месяца ад 2 °С на а-вах Арктыкі да 28, 30 °С на Пд (абс. максімум т-ры ў Е. 48 °С на Пірэнейскім п-ве); найбольш халоднага — ад 10, 12 °С на ПдЗ да −18, −20 °С на ПнУ (абс. мінімум −52 °С у бас. Пячоры). Лета з устойлівай т-рай вышэй за 10 °С на Пн Е. бывае менш як 2 месяцы, каля берагоў Міжземнага м. ад 8 да 12 месяцаў; зіма ад 2—4 месяцаў у цэнтр. частцы Е. да 6—8 месяцаў на Пн і ПнУ. Ападкаў на З і ПнЗ 1000—1500 мм за год, у цэнтр. частцы 500—750 мм, на ПнУ і ПдУ менш за 300 мм, у Прыкаспіі да 200 мм. Найбольшая колькасць ападкаў на З выпадае ўвосень і ў пач. зімы, на У і ў цэнтр. у Пд. Е. — зімою. Снежнае покрыва на З і ў Сярэдняй Е. нястойлівае, на У і ПнУ да 7—8 месяцаў, на а-вах Арктыкі амаль увесь год. Клімат Е. на Пн арктычны і субарктычны, у сярэднешыротнай палосе ўмераны (залішне вільготны на З, вільготны ў цэнтры, засушлівы на У), на Пд субтрапічны міжземнаморскі. У гарах вышынныя кліматычныя пасы.

Гідраграфія. На нелічыні слой сцёку Е. (каля 205 мм) займае 2-е месца пасля Паўн. Амерыкі, але а-за малых памераў сушы аб'ём сцёку невялікі (каля 2050 км³ за год). Вольная ч. Е. адносіцца да бас. Атлантычнага ак. і яго мораў, меншая — да Паўн. Ледавітага ак. і бас. ўнутранага сцёку — Каспійскага мора.

Вял. рэкі Е. — Волга, Урал, Дняпро, Дон, Печора, Днестр, Паўн. Дзвіна, Зах. Дзвіна цякуць па Усх. раўнінай частцы, а пераважным харчаваннем, высокімі паводкамі, летне-асенняю межанню; зімою замярзаюць. У Зах. Е. найбольшыя Дунай, Рэйн, Эльба, Вісла, Луара, Одра. Гэтыя і іншыя рэкі Сярэдняй Е. пераважна дажджавое, не замярзаюць або нярэдка замярзаюць на 1—2 месяцы. Рэкі Паўд. Е. таксама пераважна паротніі, паўнаводныя толькі вясною, летам нешмат мялеюць або перасыхаюць. Многаводныя рэкі Е. судаходныя, нешмат, злучаны каналамі (Волга з Доном, Волга з Нявой, Вісла з Одрай, Эльбай, Рэйнам, Сенай і інш.). Многія рэкі Усх. Е. выкарыстоўваюцца для сплаву лесу і выпрацоўкі эл. энергіі, вельмі багатыя на энергетычныя рэсурсы рэкі Скандынавіі і Альпаў. Асобнае значэнне рэк Паўд. Е. — арашэнне зямель. У Е. многа азёраў. Размяшчэнне пераважна ў зонах чацвярцічнага абледзянення. Найбольшыя — Ладажскае, Анежскае, Венерн, Чудское, Пейпус, Водзянае, Жнеўскае. На Рускай раўніне і на

Узбярэжжа Адрыятычнага мора каля г. Будва. Югаславія.





ЕЎРОПА, ПАЛІТЫЧНАЯ КАРТА


ПАЎНОЧНЫ ЛЕДАВІТЫ АКІЯН
ГРЭНЛАНДСКАЕ МОРА
БАРЭНЦАВА МОРА
НАРВЕЖСКАЕ МОРА
ПАЎНОЧНАЕ МОРА
БАЛТЫЙСКАЕ МОРА
ЧОРНАЕ МОРА
КАСПІЙСКАЕ МОРА
Паўночны полюс
Дацкі праліў
Фарэрскія а-вы (Дан.)
Шатландскія а-вы (Брыт.)
Ісландыя (Ісл.)
Шпіцберген (Нарв.)
Зямля Францыі-Іосіфа
Зямля Нансена
Новая Зямля
Ян-Маен (Нарв.)
Медзвежы а-вы (Нарв.)
Ян-Майен
Ісландыя
Ян-Маен
Медзвежы а-вы
Ян-Майен
Ісландыя
Медзвежы а-вы
Ян-Маен
Ісландыя
Медзвежы а-вы
Ян-Маен
Ісландыя
Медзвежы а-вы
Ян-Ма

Е. многа балотаў. Агульная плошча сучасных ледавікоў Е. перавышае 116 тыс. км². Найбольш ледавікоў на Шпіцбергене (58 тыс. км²), Новай Зямлі, Зямлі Франца-Іосіфа і ў Ісландыі. На мацерыковай частцы Е. значныя ледавікі ў Скандынаўскіх горах, Альпах, на Пн Урала, у Пірэнеях, у хр. Сьера-Невада (самы паўд. ў Е. ледавік).

Расліннасць і глебы. На раўнінах Усх. Е. добра акрэслена шыротная занальнасць глебаў і расліннасці; у горах вышынная пояснасць. На а-вах Паўн. Ледавітага ак.— арктычныя пустыні з мохава-лішайнікавай расліннасцю на маламагутных арктычных глебах. На Пн Усходне-Еўрапейскай раўніны і Фенаскандыі — тундравая зона з мохава-лішайнікавым і хмызняковым покрывам, якая на Пд пераходзіць у лесатундру; глебы тундравыя, глеевыя, часткова ападзоленыя. На Пд да Ладажскага воз. і Паўн. Увалаў, а таксама на большай ч. Фенаскандыі — яловапіхтавыя, хваёвыя і лістоўнічныя таежныя лясы на падзолістых моцна забалочаных глебах. На Пд да Шатландыі, Паўн. Польшчы, Беларускага Палесся і нізоўяў р. Камы мяшаныя хвойныя і шыракалістыя (дуб, ясень, граб) лясы на дзярнова-падзолістых глебах. Да паўн. раёнаў Паўд. Е., Валынскага і Прыволжскага ўзвышшаў — шыракалістыя лясы (дуб, клён, ліпа на У, бук, дуб, граб і каштан на З); на пясках — хвоя. Глебы на З бурыя лясныя, на У шэрыя лясныя і ападзоленыя чарназёмы. Уверх па схілах гор (Альпы і інш.) дубовыя лясы зменьваюцца букавымі, мяшанымі і хвойнымі, вышэй субальпійскія лугі з хмызнякамі і альпійскімі лугамі. На Пд ад лініі Львоў — Кіеў — Арол — Куйбышаў лесастэпавая зона, якая ахоплівае таксама Сярэднедунайскую нізіну і зах. частку Ніжнедунайскай нізіны. У межах гэтай зоны на вышчалачаных і магутных чарназёмах участкі лесу чаргуюцца са стэпам. Стэпавая зона займае ўсх. частку Ніжнедунайскай нізіны і Пд Усходне-Еўрапейскай раўніны з разнатраўна-кавыльным стэпам (на звычайных чарназёмах). На Пд Украіны і ў Ніжнім Паволжы — сухі стэп на каштанавых глебах. На Прыкаспійскай нізіне — палынна-злакавыя паўпустыні і палынна-салянкавыя пустыні на светла-каштанавых, бурых паўпустынных глебах з саланчакамі і пяскамі. У Міжземнаморскай Е.— вечназялёныя субтрапічныя ксерафітныя лясы (каменны і коркавы дуб, італьянская хвоя і інш.) і ксерафітныя фармацыі з вечназялёных і лістападных кустовых (сунічнае дрэва, кустовы дуб, філірэя, фісташка, ладаннік, дзікі бэз, адзіная ў Е. дзікарослая пальма хамероп на карычневых глебах); у горах шыракалістыя і мяшаныя лясы.




Падмаскоўны гай.

Жывёльны свет. Тэр. Е. ўваходзіць у склад наступных падабласцей Палеарктычнай біягеаграфічнай вобласці (гл. *Зоагеаграфічныя вобласці*): Арктычнай (у межах арктычнай, тундравай і лесатундравай зон) — пясец, паўн. алень, лемінгі, палярная сава, белая і тундравая курапаткі і інш.; Еўрапейска-Сібірскай (з лясной, лесастэпавай і стэпавай зонамі) — лось, зубр, дзік, ліс, воўк, буры мядзведзь, вавёрка, бабёр, зайцы — русак і бяляк, сайгак, суслік, тушканчык, сурок, палёўкі, хамякі; з птушак — рабчык, глушэц, цецярук, дзятлы, дрозд, драфа, стрэпет і інш.; Міжземнаморскай (Апенінскі, Балканскі, Пірэнейскі п-вы і суседнія а-вы) — сарна, лань, дзікі трус, дзікі кот, лятучыя мышы і інш.; Цэнтральна-Азіяцкай (з зонамі паўпустынь і пустынь Прыкаспійскай нізіны).

Насельніцтва. У Е. жыве больш за 650 млн. чал. (1968). Гэта самая густанаселеная частка свету, сярэдняя шчыльнасць насельніцтва больш за 80 чал. на 1 км². Найменшая шчыльнасць на Пн Е. (Ісландыя — 2 чал., Нарвегія — 11, Фінляндыя — 13, Швецыя — 17 чал. на 1 км²), найбольшая ў Нідэрландах (350 чал.) і Бельгіі (298 чал.). У. Е. самы высокі (больш за 50) працэнт гарадскога насельніцтва (Вялікабрытанія — 79% ФРГ — 78, Нідэрланды — 75, Данія — 74, Швецыя — 73, Ісландыя — 73, ГДР — 71%). Найб. нізкі працэнт гарадскога насельніцтва на ПдУ і

Ваколіцы Астрашыцкага Гарадка. Мінскі раён.





ПдЗ Е. (Югаславія — 26%, Партугалія — 31, Албанія — 32%). Насельніцтва Е. належыць да вялікай *еўрапеоідnай расы*, большасць народаў гаворыць на мовах індаеўрапейскай сям'і. Слав. група моў гэтай сям'і падзяляецца на 3 падгрупы: усходнюю (рускія, украінцы, беларусы), заходнюю (палякі, чэхі, славакі, кашубы, лужычане), паўднёвую (балгары, сербы, харваты, славенцы, македонцы, баснійцы, чарнагорцы). Блізкія славянам мовай і культурай народы балтыйскай моўнай групы — літоўцы і латышы. Паўн.-Зах. і Цэнтр. Е. насяляюць народы герм. моўнай групы, якая падзяляецца на паўн. падгрупу (шведы, датчане, фарэрцы, нарвежцы, ісландцы) і зах. падгрупу (немцы, аўстрыйцы, германа-швейцарцы, эльзасцы і латарынгцы, люксембуржцы, галандцы, фламандцы, фрызы, англічане, шатландцы, ольстэрцы). У Зах. і Паўд.-Зах. Е. жывуць народы раманскай моўнай групы (італьянцы, французы, іспанцы, партугальцы, каталонцы, валоны, галісійцы, франка-швейцарцы, італа-швейцарцы, карсіканцы), рэтараманскія народы (фрыулы, ладзіны, раманшы). У раманскую групу ўваходзяць блізкія да славян культураю малдаване, румыны, арамуны (влахі). Баскі, якія жывуць на Пн Іспаніі і ПдЗ Францыі, да індаеўрапейскай моўнай сям'і не належаць. Да кельцкай моўнай групы адносяцца ірландцы, уэльсцы (валійцы), гэлы, брэтонцы; асобныя моўныя групы складаюць албанцы і грэкі; цыганы належаць да інд. моўнай групы. На тэр. Е. жывуць народы уральскай сям'і: да фінскай групы гэтай сям'і адносяцца фіны (уключаючы квенаў), карэлы, эстонцы, лівы, іжорцы, вепсы, саамы (лапары), комі і комі-пермякі, удмурты, марыйцы, мардва; да угорскай — венгры (уключаючы секлераў), мансі; да самадзійскай — енцы. У цюркскую моўную групу алтайскай сям'і моў уваходзяць чувашы, татары, башкіры, туркі, гагаузы; у мангольскую — калмыкі. Да семіта-хамітскай моўнай сям'і належаць мальційцы. Яўрэі карыстаюцца мовамі тых народаў, сярод якіх яны жывуць, і моваю ідыш. З эпохі неаліту і бронзы асновай эканомікі амаль усіх народаў Е. з'яўлялася земляробства; жывёлагадоўля была пашырана на Балканскім п-ве, у Карпатах, Альпах, Ісландыі, Данії, на Фарэрскіх а-вах, рыбалоўства — у прыбярэжнай палосе. У краінах Е. развіты прамысловасць і высокамеханізаваная с. гасп. Традыц. жыллё — хата, найчасцей драўляная, аднапавярховая на Пн Е., 2—3-павярховы мураваны дом на Пд; у некат. народаў да нядаўняга часу заставаліся традыц. формы жылля: зямлянка ў румын, каліба ў сербаў, бурама ў башкіраў, жылыя гумны ў эстонцаў і латышоў, вежа ў саамаў. Традыц. адзенне народаў Е. — тупікападобная ці паліковая сарочка і розныя формы паясной вопраткі (у мужчын доўгія або кароткія штаны, у жанчын спадніца, запаска, плахта, фартух). Традыц. нацыянальныя формы ў жыллі і адзенні народаў Е. страчваюць этн. спецыфіку.


Большасць веруючага насельніцтва Е. вызнае хрысціянства: праваслаўе (усх. і паўд. славяне, усх.-раманскія народы, грэкі, мардва, удмурты і інш.), каталіцызм (амаль усе раманскія народы, зах. славяне, частка паўд. славян, літоўцы, часткова латышы, ірландцы, аўстрыйцы, фламандцы, венгры і частка немцаў), пратэстанцтва (большасць немцаў, галандцы, англічане, шатландцы, уэльсцы, датчане, шведы, нарвежцы, фіны). Частка насельніцтва Е. (туркі, татары, частка баснійцаў, большасць албанцаў) вызнае іслам. Пераважная большасць насельніцтва Еўрап. часткі СССР і краін сацыяліст. лагера — атэісты. Гл. таксама *Народы Еўропы*.

Палітычны падзел. На тэр. Е. размешчаны дзяржавы сацыяліст. лагера: Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (Еўрап. частка), Албанія, Балгарыя, Венгрыя, Германская Дэмакратычная Рэспубліка, Польшча, Румынія, Чэхаславакія, Югаславія; капіталіст. краіны: Аўстрыя, Бельгія, Вялікабрытанія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Ісландыя, Іспанія, Італія, Люксембург, Нарвегія, Нідэрланды, Партугалія, Турцыя (еўрап. частка), Федэратыўная Рэспубліка Германіі, Фінляндыя, Францыя, Швейцарыя, Швецыя і невялікія дзяржавы (Андора, Ватыкан, Ліхтэнштэйн, Мальта, Манака, Сан-Марына); асобная паліт. адзінка — Зах. Берлін. (Палітычную і эканамічную характарыстыку дзяржаў Е. гл. ў артыкулах пра асобныя краіны.)

Літ.: Физическая география частей света, М., 1963; Ерамов Р. А. Физическая география материков и океанов. Западная Европа, М., 1960; Физико-географическое районирование СССР, М., 1968; Мильков Ф. Н. и Гвоздецкий Н. А. Физическая география СССР, М., 1969; Народы зарубежной Европы, т. 1—2, М., 1964—65; Народы Европейской части СССР, т. 1—2, М., 1964; Hoffman G. W. A geography of Europe, London, 1954.

В. А. Дзяменцьеў, Э. Р. Сабалеўка (насельніцтва). Мінск.

ЕЎРЫПІД (Euripidēs; каля 480 цi 484, в-аў Саламін — 406 да н. э.), старажытнагрэчаскі драматург. Са знатнага афінскага роду. Драматург. дзейнасць пачаў у 455. З 408 жыў у Македоніі. З 92 п'ес Е. збераглося 17 трагедый і сатыраўская драма «Кіклоп». Трагедыі распрацоўвалі надзённыя філас., паліт. і маральныя праблемы эпохі распаду афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі. Найб. ранняя п'еса «Алкестыда» (438) напісана ў традыцыях Эсхіла і Сафокла. Пазней Е. адышоў ад прынцыпаў класічнай афінскай трагедыі. Пераасэнсаванне традыц. трактоўкі міфаў, элементы рэліг. скептыцызму, цікавасць да ўнутр. свету чалавека, глыбокая псіхал. распрацоўка характараў, асабліва жаночых (Медэя, Федра, Іфігенія), выкарыстанне рэаліст. бытавых дэталяў, складанасць інтрыгі, высокая трагедыйная напружанасць дзеяння характэрныя трагедыям «Медэя» (431), «Іпаліт» (428), «Траянкі» (415), «Алена» (412), «Арэст» (408) і інш. БДТ-2 паставіў трагедыю Е. «Вакханкі» (1926).



Тв.: Рус. пер. — Трагедии, т. 1—2, М., 1969.

ЕЎСЦІГНЕЕЎ Іван Сцяпанавіч [7(20).1.1913, ст. Убінская Каінскага пав. Томскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1930. Вызначыўся ў вер. 1943 у Палескай вобл. Полк пад камандаваннем Е. ў ноч на 29.9.1943 фарсіраваў Дняпро каля Брагіна. На захопленым плацдарме адбіў больш за 10 контратак. Жыве ў Тамбове.

ЕЎСЦІГНЕЕЎ Міхаіл Аляксандравіч [5(17). 9.1895, Наваторжскі пав. Цвярской губ.— лета 1920], удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З сялян. Чл. Камуніст. партыі з 1915. З 1911 слесар на з-дах у Цверы, Свеаборгу, Петраградзе. За ўдзел у забастоўцы на Іжорскім з-дзе зняволены ў турму. Пасля Лют. рэвалюцыі працаваў у прафсаюзах Петраграда. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі, агітатар Петраградскага к-та РСДРП(б). З ліст. 1917 у Віцебску. Заг. аддзела прамысловасці Віцебскага губвыканкома, старшыня губернскага Савета фабзаўкомаў. З ліп. 1918 старшыня Віцебскага губ. Савета нар. гаспадаркі. З 1919 на Паўд. фронце, пасля старшыня СНГ Данской вобл. Яго імем названы гарбарны з-д у Віцебску.

К. М. Коласаў. Віцебск.

ЕЎТУШЭНКА Яўген Аляксандравіч (н. 18.7. 1933, г. Зіма Усходне-Сібірскага краю), рускі савецкі паэт. Вучыўся ў Літ. ін-це імя М. Горкага. Першы зб. «Разведчыкі будучыні» (1952). Аўтар зб. «Шаша Энтузіястаў» (1956), «Абяцанне» (1957), «Пяшчотнасць» (1962), «Узмах рукі» (1962), «Катэр сувязі» (1966), «Ідуць белыя снягі» (1969), паэм «Брацкая ГЭС» (1965), «Казанскі універсітэт» (1970), шэрагу апавяданняў. Найлепшыя творы Е. вызначаюцца публіцыстычнасцю, тонкім лірызмам, надзённасцю тэматыкі. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Братская ГЭС. Стихи и поэмы, М., 1967; Под кожей статуи Свободы, «Неман», 1970, № 8; бел. пер. у час.— «Полымя», 1961, № 7; «Маладосць», 1961, № 7; «Работніца і сялянка», 1963, №1.

Літ.: Макаров А. Поэзия. Идущим вослед. Полемика, М., 1969; Рунин Б. Уроки одной поэтической биографии, «Вопросы литературы», 1963, № 2.

ЕЎФРАТ (арабск. Шат-эль-Фурат), рака ў Турцыі, Сірыі і Іраку. Даўж. каля 2700 *км*, пл. бас. каля 673 тыс. *км*². Утвараецца ад зліцця рэк Мурат і Карасу, якія пачынаюцца на Армянскім нагор'і. Гал. прыток р. Хабур (левы). Пасля зліцця з Тыграм Е. утварае Шат-эль-Араб.

У межах Армянскага нагор'я, Армянскага Таўра і плато Верхняй Месапатаміі Е. мае горны характар, у ніжнім цячэнні па Месапатамскай нізіне рэчышча абвалавана ад разводдзяў. Жыўленне снегава-дажджавое, паводка вясною. Сярэдні гадавы расход вады каля г. Хіт 838 *м*³/*сек*, памяншаецца ад выпарэння і расходу вады на арашэнне да 458 *м*³/*сек* каля вусця. Многа завісных часцінак, каля Хіта за год рака праносіць 13—15 млн. *т*. Суднаходства ад вусця да Хіта. З дапамогай СССР на тэр. Сірыі ў раёне Табка будуецца (з 1968) гідратэхнічны комплекс: вадасховішча і ГЭС.

ЕЎХАРЫСТЫЯ (прычашчэнне), магічнае культавае дзеянне ў хрысціянскай рэлігіі. Гл. *Таінствы хрысціянскія*.

ЕФІМЁНКА Аляксандра Якаўлеўна [31.5 (12.6).1848, в. Варзуга Кемскага пав. Архангельскай губ.— снеж. 1918], рускі гісторык. Першая ў Расіі жанчына — ганаровы д-р рус. гісторыі (1910). З сялян. Настаўнічала і займалася гістор.-этнагр. дзейнасцю на Поўначы, пасля на Украіне і ў Пецярбурзе. Аўтар прац па гісторыі грамадскіх і агр. адносін у Расіі, «Гісторыі ўкраінскага народа» (в. 1—2, 1906), падручнікаў па рус. гісторыі. Далучалася да ліберальна-народніцкага кірунку ў гістарыяграфіі. На яе працы звярнулі ўвагу К. Маркс, Ф. Энгельс і У. І. Ленін. Забіта пятлюраўцамі.

Тв.: Народный суд в Западной Руси, «Русская мысль», 1893, кн. 8—9; О конных судах, у кн.: Труды девятого археологического съезда в Вильне, т. 2, М., 1897; Литовско-русские данники и их дани, у яе кн.: Южная Русь, т. 1, СПб., 1905.

ЕФРАІМКІ, фальшывыя польскія манеты, якія выпускаліся ў 1753—62 пры прускім каралю Фрыдрыху II манетнымі дварамі Кёнігсберга, Брэслава, Штэціна і Лейпцыга.

Назва паходзіць ад імя манетчыка Ефраіма. Ад сапр. манет адрозніваліся вельмі нізкай якасцю. У час сямігадовай вайны 1756—63 Е. ў вялікай колькасці пранікалі на тэр. Рэчы Паспалітай і расстройвалі грашовую гаспадарку краіны.

ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ (свецкае імя Прадслава; каля 1120—23.5.1173), князёўна, ігумення манастыра Спаса ў Полацку, асветніца перыяду Кіеўскай Русі. Пастрыгшыся ў манашкі, пасялілася ў «галубніцы» Полацкай Сафійскай царквы і перапісвала царк. кнігі. Мяркуюць, што пісала летапісы і арыгінальныя творы. Пабудавала жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі асяродкамі асветы ў Полацкім княстве, дзве царквы. На яе заказ Л. *Богша* ў 1161 зрабіў каштоўны крыж — узор мясцовага маст. рамяства. Звесткі пра Е. П.— у «Жыціі Ефрасінні Полацкай» (12—13 ст., дайшоў спіс 14 ст.); у цэнтры яго — канфлікт манашкі-падзвіжніцы з бацькам, князем Георгіем Усяславічам, які ўспрыняў уцёкі «под иго Христово» 12-гадовай дачкі, а пазней звабленай яе прыкладам малодшай дачкі Гардзіславы як сямейную драму. Ідэалізуецца затворніцтва, тыповыя жыційнай л-ры «цуды» перамяжоўваюцца з рэальнымі справамі энтузіястаў новай на той час хрысц. культуры на тэр. Беларусі. Паломнічала ў Іерусалім, там памерла.

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968, с. 74—75; Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры, Мн., 1959, с. 68—81.

У. А. Калеснік. Брэст.

Ё

Ё, сёмая літара беларускага алфавіта. Спалучэнне літары «е» з дыякрытычнымі знакамі. Запазычана з рускай графікі, дзе ўпершыню з'явілася ў 1797. Абазначае лабіялізаваны галосны «о» задняга раду сярэдняга пад'ёму і мяккасць папярэдняга зычнага («вёска — в'оска»), а ў пачатку слова, пасля галосных, «ў», «ь» і апострафа — 2 гукі («й» і «о»): «ёд» («йод»), «тваё» («твайо»), «пугаўё» («пугаўйо»), «мільён» («мільйон»), «аб'ём» («абйом»).

ЁД (Iodum), I, хімічны элемент VII групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева; ат. нумар 53; ат. м. 126, 904.

У прыродзе трапляецца ў выглядзе злучэнняў стабільнага ізатопа ^{127}I. У зямной кары 3·10^{-5}% па масе. Канцэнтруецца ў водарасцях і ў шчытападобнай залозе чалавека. Пры звычайных т-рах Ё.— цёмныя крышталі з фіялетавым метал. бляскам. Пры награванні ўзганяецца, *t* пл. 113,5 °С. Шчыльн. 4930 *кг/м*^{3}. Растварэцца ў большасці арган. растваральнікаў, дрэнна — у вадзе, добра ў водным растворы KI. Малекулы Ё. двухатамныя. Адносіцца да *галагенаў*, моцны акісляльнік. Асноўныя валентнасці: –I, +V, +VII. З кіслародам, серай, азотам непасрэдна не рэагуе; з вадародам і многімі металамі ўзаемадзейнічае толькі пры награванні. Лёгка рэагуе з аднаўляльнікамі, фторам, хлорам і бромам. Ужываецца ў медыцыне, у лабараторнай практыцы, пры вырабе высакачыстых металаў, электралітнаў. Здабываецца з вады нафтавых радовішчаў, салетравых адкладаў, попелу водарасцей. Атрутны. Гранічна дапушчальная канцэнтрацыя Ё. ў паветры 0,001 *мг/л*.

Літ.: Ксензенко В. И. и Стасиневич Д. С. Технология брома и йода, М., 1960.

ЁДАВА (Ёдзі), возера ў бас. Страчы, правага прытока Віліі, у Астравецкім р-не Гродзенскай вобл. Пл. 0,61 *км*^{2}. Даўж. 1,6 *км*, найб. шыр. 0,5 *км*, сярэдняя 0,3 *км*, найб. глыб. 19,3 *м*, сярэдняя 7 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ, схілы стромкія, супяскчаныя, выш. 10—18 *м*. Паўн.-ўсходнія над ворывам, астатнія ўкрыты лесам і хмызняком. Вадазбор (4,98 *км*^{2}) спадзіста-хвалісты. Сцёк праз пратоку ў воз. Гульбеза. Водзяцца плотка, акунь, язь, ліпь.

ЁДЗІЧЫ, вёска ў Бераставіцкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 5 *км* на З ад Вял. Бераставіцы, 68 *км* ад Гродна, 17 *км* ад чыг. ст. Бераставіца. 178 ж., гасп. 57 (1971). Васьмігадовая школа, адда. сувязі.

ЁДЫ, вёска ў Шаркоўшчынскім р-не Віцебскай вобл., на р. Густатка. Цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». За 18 *км* на ПнЗ ад Шаркоўшчыны, 217 *км* ад Віцебска, на шашы Шаркоўшчына — Браслаў. 357 ж., гасп. 124 (1971). Лясніцтва. Маслазавод, пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі, сталовая, 3 магазіны.

ЁМІСТАСЦЬ, 1) велічыня, якая характарызуе здольнасць правадніковў або іх сістэм назапашваць электрычны зарад. Колькасна роўная адносіне заряду, што перадаецца правадніку, да змянення яго патэнцыялу: $C=Q/V$. У сістэме СІ адзінка Ё.— *фарада*.

Для ізаляванай сферы ў вакууме патэнцыял роўны $V=Q/r$. Ё. такой сферы колькасна роўная яе радыусу *r*. За абс. электрычную адзінку Ё. прынята Ё. адасобленага шара радыусам 1 см. Ё. залежыць ад памераў і ўзаемнага размяшчэння правадніковў, а таксама навакольнага асяроддзя. Есць сістэмы правадніковў (напр., *кандэнсатар электрычны*), Ё. якіх практычна не залежыць ад сусветніх целаў. Ё. вымяраецца маставымі вымяральнымі прыладамі, звычайна метадам параўнання невядомай Ё. з эталоннай.

2) Ё. акумулятара — колькасць электрычнасці, якая паглынаецца акумулятарам пры яго зарадзе (зарадная Ё.) або аддаецца ім пры разрадцы да пэўнага мінім. напружання (разрадная Ё.). Гл. *Электрычны акумулятар*.

Літ.: Иоссель Ю. Я., Кочанов Э. С. и Струнский М. Г. Расчет электрической емкости, Л., 1969; Дасоян М. А. Химические источники тока, 2 изд., Л., 1969.

ЁТКІ, вёска ў Лідскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Лідзея. Цэнтр Траццякоўскага с/с і калгаса «Запаветы Ільіча». За 6 *км* на ПдУ ад Ліды, 138 *км* ад Гродна, каля шашы Ліда — Слонім (0,5 *км*). 305 ж., гасп. 94 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін.

ЁЎНЯ, аднапавярховая зрубная пабудова для сушкі снапоў перад абмалотам, пашыраная на У Беларусі ў 19 ст. Размяшчалася ў гумне ці побач з токам, мела шчыльную столь з бярвення і імшаныя сцены. Абагравалася печчу-каменкай. Снапы ставілі ў 1—2 паверхі на жэрдкі-цапкі, якія можна было перамяшчаць па бэльках. Ё. зніклі з пашырэннем малатарняў.

Ж

ж Ж Ж ж Ж ж Ж ж

Глаголіца балгарская 11 ст. | Уставъ 11 ст. | Царкоўна-славянская 13—16 ст. | Царкоўна-славянская 16—18 ст. | Скорапіс 15 ст. | Беларускі скорапіс 16 ст. | Паўуставъ канца 17 ст. | Грамадзянская печ. 18 ст.

Ж, восьмая літара беларускага алфавіта. Бярэ пачатак з кірыліцкай Ж («живете»). У сучаснай бел. мове абазначае шумны звонкі паднябенна-зубны шчылінны цвёрды зычны «ж» («жыта», «лыжы»), а перад глухімі зычнымі і на канцы слоў — парны да яго па звонкасці гук «ш» («сцежка», «нож» вымаўляюцца «сцешка», «нош»).

ЖАБА Ян Казімір (г. н. невядомы — май 1754), пам. гетмана (рэгіментар) войск літоўскіх, палкоўнік. З бел. шляхецкага роду. Магнат Полацкага ваяводства. Выбіраўся дэпутатам у Гал. літоўскі трыбунал і ў сеймы. З 1721 мінскі ваявода. Падтрымліваў каталіцызм. Ж. і яго нашчадкі валодалі Ушачамі.

ЖАБЕНЦЯІ, вёска ў Бабініцкім с/с Віцебскага р-на. Цэнтр калгаса «40 гадоў Кастрычніка». За 22 *км* на ПнУ ад Віцебска, каля шашы Віцебск — Сураж. 255 ж., гасп. 85 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін.

ЖАБЕР, умацаваны замак князёў Вішнявецкіх у Берасцейскім ваяводстве Вял. кн. Літ., на правым беразе р. Ясельды, абаронцы якога аказалі ўпартае супраціўленне швед. войскам у Паўночную вайну 1700—21.


Для свайго часу першакласнае ўмацаванне, блізкае па форме да 4-вугольніка з бастыёнамі галандскага тыпу на кожным вугле, плошчай каля 1,6 *га*, абведзенае земляным валам. З 3 бакоў акружаны каналам шыр. да 15 і глыб. да 5 *м*, з 4-га — р. Ясельдай. З навакольлем меў сувязь праз разборны мост. 13.5.1706 Ж. асадзілі войскі прыхільніка Швецыі караля Рэчы Паспалітай С. Лешчынскага і прапанавалі здацца. Гарнізон Ж. (700 чал., 40 гармат і інш.) адбіў штурмы польскіх, а потым і швед. войск. Пасля гэтага швед. кароль Карл XII узначаліў асаду. Камендант замка немец Ботман быў падкуплены і здаў яго без бою, замак быў зруйнаваны па загадзе Карла XII. Рэшткі замка — за 3 км на ПнЗ ад в. Жабер Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. Пры археал. абследаванні замчышча знойдзены фрагменты керамікі 17—18 ст., кавалкі баразнаватай цэглы, чарапіцы, кафлі.

Літ.: Покровский Ф. В. Археологическая карта Гродненской губ., Вильна, 1895.

М. А. Ткачоў. Мінск.

ЖАБІНКА, рака, правы прыток Мухаўца (бас. Буга). Даўж. 25 *км*. Цячэ ў Камянецкім і Жабінкаўскім р-нах Брэсцкай вобл. Вадазбор (228 *км*^{2}) на тэр. Брэсцкага Палесся. Рэльеф плоска-хвалісты. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 0,78 *м*^{3}/*сек*. На рацэ пры ўпадзенні яе ў Мухавец г. Жабінка.


ЖАБІНКА, горад (з 1970), цэнтр Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл., пры ўпадзенні р. Жабінка ў Мухавец. Вузел чыгунак на Мінск, Брэст, Гомель. За 30 *км* на У ад Брэста. 6,9 тыс. ж. (1971). Узнік у 1871. Развіта харч. прамысловасць: цукровы, камбікормавы, крухмальны з-ды, маслазавод. Асфальтабітумны з-д, камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі. 2 сярэднія школы, школа-інтэрнат, школа рабочай моладзі, завочная, дзіцячая спарт. і муз. школы, дзіцячыя яслі і сад, Дом піянераў, кінатэатр, 2 б-кі, бальніца. Помнік У. І. Леніну, 3 помнікі сав. воінам, партызанам, ахвярам фашызму, якія загінулі ў Айч. вайну.



На Жабінкаўскім цукровым заводзе.

ЖАБІНКАЎСКІ РАЁН, у складзе Брэсцкай вобл. Утвораны 15.1.1940. Размешчаны на З вобл. Пл. 0,7 тыс. *км*^{2}. Нас. 25,3 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 7 сельсаветаў. Цэнтр г. Жабінка.


Паверхня раёна нізінна-раўнінная. Паўн. частка ў межах *Прыбугскай раўніны* (выш.



да 200 *м*), цэнтр. і паўд. частку займае *Брэсцкае Палессе* (выш. да 150 *м* над узр. м.). Карысныя выкапні: радовішча торфу Гатча-Асоўскае з агульнымі запасамі 10,7 млн. *т*, радовішча буд. пяскоў Булькова — 6,1 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —4,5, ліп. 18,7 °С. Ападкаў 535 *мм* за год. Вегет. перыяд 208 дзён. Па тэр. раёна цячэ р. Мухавец з прытокамі Трасцяніца, Асіпоўка (злева), Паляхва і Жабінка (справа). Найбольшае гасп. значэнне мае Мухавец. Далiны рэк плоскія, шырокія, часта невыразна акрэсленыя. Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (17,3%), дзярнова-падзолістыя забалачаныя (35,6%), дзярнова-балотныя (32,8%), дзярновыя забалачаныя (4,8%), тарфяна-балотныя (9,5%). З мінер. глебаў 58,1% супясчаных, 36,7 пясчаных, 5,2% суглінкавых. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель — 40 (цана бала 0,24 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 22, усіх с.-г. угоддзяў — 33. Пад лесам 17,6% тэр. Калля ²/₃ пл. займае хвоя; з лісцевых бяроза, вольха, асіна. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы, палякі. Сярэдняя шчыльн. 36,1 чал. на 1 *км*². Гарадскога нас.

Цэнтральная сядзіба саўгаса «Рагазянскі».





Культывацыя глебы ў саўгасе «Беларусь».

27,3%. Прамысл. прадпрыемствы працуюць пераважна на мясцовай сыравіне; размешчаны ў Жабінцы: з-ды цукровы, камбікормавы, крухмальны, маслазавод, асфальта-бітумны; камбінат быт. абслугоўвання, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі; торфабрыкетны з-д рыбгас «Сакалова». У раёне 9 калгасаў і 3 саўгасы (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Азяты)*, «Запаветы Ільіча» *(Падлессе)*, імя Куйбышава *(Маціевічы)*, «Перамога» *(Арэпічы)*, «Прамень» *(Вялікія Якаўчыцы)*, «Радзіма» *(Сакі)*, «Світанне» *(Крыўляны)*, «Усход» *(Шпіталі)*, імя Чапаева *(Вежкі)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Беларусь» *(Пятровічы)*, «Жабінкаўскі» *(Жабінка)*, «Рагазянскі» (пас. *Ленінскі*).


С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, буракаводстве; вырошчваюць бульбу, збожжавыя культуры. Пад с.-г. ўгоддзямі 62% тэр. На пач. 1971 асушана 7,0 тыс. *га* забалочаных зямель. Пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 25,9, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 12,7, тэхнічнымі (цукр. буракі, лён) 1,4, бульбай 4,2, кармавымі культурамі 7,5. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 22,7, у т. л. кароў 11,0; свіней 13,8, авечак 4,0. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Масква — Брэст і Жабінка — Гомель. Асн. чыг. вузел Жабінка. Аўтамаб. дарогі Баранавічы — Брэст і Камянец — Федзькавічы.

У 1970 у раёне было 8 сярэдніх, 6 васьмігадовых, 31 пач. школы, школа рабочай моладзі, завочная школа, 20 клубных устаноў, 13 масавых б-к, 29 кінаўстановак, у т. л. 2 стацыянарныя; 2 бальніцы, 3 урачэбныя ўчасткі, 12 фельч.-ак. пунктаў. На пач. 1970 у раёне 213 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 11 аграномаў, 8 эканамістаў, 7 заатэхнікаў, 163 настаўнікі, 24 урачы; 406 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Раённая газ. «Сельская праўда».

П. Д. Раманчанка. Брэст. *вобл.*

ЖАБІЦКІ Генадзь Мікалаевіч (н. 22.5.1933, в. Барок Сенненскага р-на), дзеяч ЛКСМБ. З сляз. ч. КПСС з 1959. Скончыў БДУ імя Леніна (1955). У 1955—59 на камсамольскай рабоце ў Магілёўскай вобл. У 1959—64 сакратар, у 1964—70 першы сакратар ЦК ЛКСМБ. З 1970 у апараце ЦК КПБ. На XXVI і XXVII з'ездах КПБ выбраны чл. ЦК. У 1966—71 канд. у чл. Бюро ЦК КПБ. Дэп. Вярх. Савета СССР 7-га скл. і Вярх. Савета БССР 6-га скл. Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ЖАБНІК (Hydrocharis), род водных свабодна плаваючых шматгадовых раслін сям. жабнікавых. Вядома 2 віды, пашыраныя ў Еўропе і Азіі. На Беларусі 1 від — Ж. звычайны (H. morsus-ranae, народная назва парэз).



Жабнік звычайны.

Сцябло Ж. выш. 15—35 см, з доўгімі міжвузельнымі. Лісце шырока-яйцападобнае, на чаранках, сабранае ў разетку. Кветкі вялікія, белыя, адзіночныя ці ў суквецціх. Расце ў азёрах, сажалках. Размнажаецца пераважна парасткамі. Зімуе ў выглядзе асобных пупышак, якія ўвосень апускаюцца на дно, а вясною ўсплываюць на паверхню вады. Разводзіцца ў акварыумах.

Літ.: Флора БССР, т. 1, М., 1949.

ЖАБРАЦКІЯ ОРДЭНЫ, агульная назва некат. каталіцкіх манашскіх ордэнаў.

Засн. ў канцы 12—13 ст. Паводле статута члены Ж. о. не маглі мець уласнасці, сталага жылля, павінны былі жыць жабрацтвам. Царква лічыла, што пропаведзь беднасці і асабісты прыклад манахаў спыняць пашырэнне ерасі. Абавязак чл. Ж. о. жыць жабрацтвам не заўсёды выконваўся, пазней быў адменены. У 17 ст. ў сувязі з актывізацыяй экспансіянісцкай палітыкі Ватыкана ва Усх. Еўропе Ж. о. а'явіліся і на Беларусі. Найб. пашырыліся *дамініканцы, францысканцы*, а таксама кармеліты. Існуюць у розных краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі, Лац. Амерыкі (паводле звестак 1967 налічваюць каля 90 тыс. чл.).

ЖАБРОЎСКІ Канстанцін Адамавіч [псеўд. Костка, Навіцкі; 1838, Аўгустоўская губ. — 24.6(6.7).1863], удзельнік паўстання 1863 на Беларусі. Служыў у арміі, падпаручнік. З крас. 1863 паўстанцкі ваен. начальнік Сенненскага пав. Магілёўскай губ. Сфарміраваў атрад, перайшоў з ім у Барысаўскі пав. Мінскай губ., дзе быў схоплены карнікамі і расстраляны ў Барысаве.

Літ.: Дьяков В. А. Деятели русского и польского освободительного движения в царской армии 1856—1865 гг. Биобиблиографический словарь, М., 1967.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

ЖАБРЫ, органы дыхання жывёльных аргатызмаў (рыб, малюскаў, вышэйшых кольчатых чарвей, некат. членістаногіх, лічынкавых стадый земнаводных і інш.), якія дыхаюць кіслародам, растворaным у вадзе.

У беспазваночных жывёл — перыстыя, грабеньчатыя ці ніткападобныя выросты на розных частках цела: у рыб — багатыя на крывяносныя сасуды жаберныя пялёсткі, размешчаныя на перагародках паміж жаберными шчылінамі (у акул) або на жаберных дужках (у касцістых рыб). Праз тонкія сценкі Ж. з крыві, якая цыркулюе па іх, выдзяляецца ў ваду вуглякіслы газ і паглынаецца раствораны ў ёй кісларод.

Літ.: Гл. пры арт. *Параўнальная анатомія жывёл.*

ЖАБЫ, *сапраўдныя жабы* (Ranidae), сямейства бясхвостых земнаводных. Вядома каля 500 відаў (32 роды), пашыраных на ўсім зямным шары, за выключэннем арктычных раёнаў, Аўстраліі і паўд. ч. Паўд. Амерыкі. У СССР 11 відаў, на Беларусі 4.

Памеры цела Ж. 3—32 см. Характэрныя асаблівасці: скура пераважна гладкая, на верхняй сківіцы зубы; самкі большыя за самцоў. На тэр. Беларусі азёрная (Rana ridibunda) і сажалкавая Ж. (R. esculenta) — водныя формы, маюць звычайна зялёны колер, жывуць заўсёды ў вадзе ці каля яе; травяная (R. temporaria) і вастрамордая Ж. (R. terrestris) — наземныя формы, бурага колеру, за вачамі маюць цёмныя плямы, жывуць на балотах, заліўных лугах, палянах. Ж. знішчаюць шкодных насякомых, імі кормяцца некат. рыбы, птушкі і млекакормячыя. У некат. краінах ж. ужываюць у ежу. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Земнаводныя.*

Літ.: Жизнь животных, т. 4, ч. 2, М., 1969.

Я. С. Юрочка. Мінск.

ЖАВАРАНКАЎ Мікалай Міхайлавіч [н. 25.7 (7.8).1907, с. Стралецкія Высолкі Міхайлаўскага пав. Разанскай губ.], савецкі вучоны ў галіне неарган. хіміі і хім. тэхналогіі. Акад. АН СССР (1962, чл.-кар. 1953). Чл. КПСС з 1939. Герой Сац. Працы (1969). Скончыў Маскоўскі хіміка-тэхнал. ін-т (1930). Дырэктар Ін-та агульнай і неарган. хіміі АН СССР (з 1962). Асн. навук. працы па гідрадынаміцы і масаабмене ў працэсах абсорбцыі, рэктыфікацыі, малекулярнай дыстыляцыі, па вывучэнні асобных стадый вытворчасці аміяку і азотнай к-ты, па хіміі і тэхналогіі стабільных ізатопаў лёгкіх элементаў, па распрацоўцы метадаў раздзялення сумесей і тонкай ачыстцы рэчываў і інш. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі, Дзярж. прэмія СССР 1953, прэмія імя Мендзялеева 1950, Залаты медаль імя Мендзялеева 1969.



Літ.: К 60-летию академика Н. М. Жаворонкова, «Журнал Всесоюзного химического общества им. Менделеева», 1967, т. 12, № 4.

ЖАВАРАНКІ, *жаваранкавыя* (Alaudidae), сямейства птушак атр. вераб'іных. 74 віды, пашыраныя пераважна ў Афрыцы, Еўропе і Азіі (у Амерыцы і Аўстраліі па 1 відзе). У СССР 14 відаў, на Беларусі 4: палявы Ж. (Alauda arvensis), лясны Ж. (Lullula arborea), чубаты Ж. (Galerida cristata, нар. назвы: смяцюх, сметнік) і рагаты Ж. (Eremophila alpestris).



Чубаты жаваранак.

Даўж. цела да 25 см, маса 20—60 *г*. Апярэнне спіны і галавы буравата-шэрае, валляка і грудзей — плямістае. На тэр. Беларусі Ж.— пералётныя птушкі. Прылятаюць у канцы красавіка, адлятаюць у верасні. Насяляюць пераважна палі, сухія лугі, лясныя высечкі. Гнездуюцца на зямлі. Нясуць 3—6 яец (некат. двойчы на год). Наседжваюць 12—16 дзён. Кормяцца насеннем дзікіх і культ. травяністых раслін, насякомымі.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Жизнь животных, т. 5, М., 1970. *Р. К. Кажэўнікава.* Мінск.

ЖАВАРЫ (Javari), рака ў Паўд. Амерыцы, правы прыток Амазонкі. Амаль на ўсім працягу з'яўляецца граніцай паміж Бразіліяй і Перу. Даўж. 1056 *км*. Бярэ пачатак у перадгор'ях Перуанскіх Андаў, цячэ па Амазонскай нізіне. Суднаходная на 500 *км* ад вусця для невялікіх суднаў.

ЖАГЛОЎ Пётр Іванавіч (н. 1.7.1929, хутар Новенькі Каменскага р-на Уральскай вобл.), перадавік нафтаздабыўной прамысловасці. Герой Сац. Працы (1971). У 1949—68 у Пахвіснеўскай канторы свідравання аб'яднання Кінельнафта; свідравальшчык, інжынер разведвальнага ўчастка, ст. майстар па складаных работах. З 1968 майстар па складаных работах управлення буравых работ Рэчыцабурнафта аб'яднання Беларусьнафта. Дэп. Вярх. Савета БССР 8-га скл.

ЖАГРАНКОЎ Іван Міхайлавіч (10.11.1923, в. Паловы Асташкаўскага пав. Цвярской губ.— 3.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942, камандзір аддзялення. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 22.6.1944 у баі за в. Арэхі Бешанковіцкага р-на і 24.6.1944 пры фарсіраванні Зах. Дзвіны. 3.7.1944 у баі за в. Троіцкую з вязкаю гранат кінуўся пад варожы танк.

ЖАДУНЬ, возера ў бас. р. Альзініца, левага прытока Ушачы, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,53 *км*². Даўж. 1,4 *км*, найб. шыр. 0,5 *км*, сярэдняя 0,4 *км*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Схілы пераважна пад ворывам. Вадазбор (32,3 *км*²) дробнаўзгорысты. Ж. праточнае: злучана пратокамі з азёрамі Ухвішча і Братоўна. Водзяцца плотка, гусцяра, лешч, акунь, шчупак.

ЖАДУНЬКА, рака, правы прыток Беседзі (бас. Сажа). Даўж. 47 *км*. Цячэ ў Клімавіцкім і Касцюковіцкім р-нах Магілёўскай вобл. Вадазбор (448 *км*²) на ПдУ Аршанска-Магілёўскай раўніны. Паверхня слаба перасечаная, узгорыстая, зрэдку забалочаная. Найб. прытокі злева — Крупянка, Крупня. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 2,65 *м*³/*сек*. На рацэ г. Касцюковічы.

ЖАЖЭЛКА, вёска ў Жодзінскім с/с Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Урыцкага. За 10 *км* на ПпУ ад Смалявіч, 48 *км* ад Мінска, 8 *км* ад чыг. ст. Чырвоны Сцяг. 247 ж., гасп. 88 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЖАКАРДА МАШЫНА, механізм *ткацкага станка*, які ўтварае прамежкі (зевы) паміж ніткамі асновы.

Створана ў 1804—08 франц. вынаходнікам Ж. М. Жакарам (няправільна Жакардам). У адрозненне ад рамізных зеваўтваральных механізмаў (эксцэнтрыкі, карэткі), што кіруюць вял. групай нітак асновы, Ж. м. кіруе асобна кожнай ніткай асновы ці невялікай іх групай. Гэта дае магчымасць вырабляць тканіны такіх перапляценняў, паўторны элемент якіх мае мноства нітак па аснове і па ўтку. З дапамогай Ж. м. вырабляюць дэкар. тканіны, дываны з выразнымі маляўнічымі, іншы раз вельмі складанымі малюнкамі (пейзажы, партрэты і інш.).

Літ.: Гл. пры арт. *Ткацкі станок*.

ЖАКАЎ Міхаіл Сцяпанавіч (н. 13.10.1928, с. Стары Кувак Бугульмінскага кантона Татарскай АССР), беларускі савецкі вучоны ў галіне ветэрынарыі. Д-р вет. н. (1968), праф. (1969). Чл. КПСС з 1957. Скончыў Казанскі вет. ін-т (1951). Асістэнт (1954—61), дацэнт (1961—69) кафедры паталагічнай анатоміі, рэктар (з 1968) Віцебскага вет. ін-та. Аўтар прац па патагенезе, паталагічнай анатоміі і дыягностыцы чумы, рожы, паратыфу і хваробы Аўескі свіней, лістэрэлёзу і беламышачнай хваробы авечак, імунамарфалогіі інфекц. хвароб жывёл.

Тв.: Патологоанатомическое вскрытие животных и оформление протокола, Мн., 1968; Гістахімія і некаторыя пытанні патагенезу чумы і рожы свіней, «Весці АН БССР. Сер. с.-г. навук», 1966, № 4.

ЖАКЕРЫЯ (Jacquerie), антыфеад. сялянскае паўстанне ў Францыі 1358. Назва паходзіць ад зняважлівай мянушкі Жак-Прасцяк, якою дваране называлі сялян.

Развіццё таварна-грашовых адносін, адзінага ўнутр. рынку выклікала пераход да грашовай раты і, як вынік, узмоцненую эксплуатацыю сялянства. *Стогадовая вайна 1337—1453* пагоршыла становішча сялян. Стыхійнае паўстанне пачалося ў маі ў Бавезі і хутка ахапіла значную частку паўн. і паўн.-ўсх. Францыі. Паўстанцы рабавалі і палілі замкі, забівалі дваран, знішчалі запісы феад. павіннасцей. Сутычка з каралеўскім войскам каля в. Мело ў чэрвені скончылася паражэннем паўстанцаў. Да жн. ішла расправа над сялянамі (паводле хронік было забіта да 20 тыс. чал.). Неарганізаванасць, стыхійнасць, адсутнасць паўнага плана, узбраення абумовілі паражэнне паўстання. Ж. выявіла значную рэвалюц. энергію сялянства і спрыяла больш хуткаму вызваленню сялян ад асабістай прыгоннай залежнасці.

Кр.: Французская деревня XII—XIV вв. и Жакерия. М.— Л., 1935.

Літ.: Семенов В. Ф. Жакерия. Л., 1958.


ЖАЛА Сямён Сяргеевіч (н. 16.4.1918, с. Асадзькаўка Купянскага пав. Харкаўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1938. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15.10.1943 з групай разведчыкаў першы фарсіраваў Дняпро каля Лоева. Байцы захапілі плацдарм і ўтрымлівалі да падыходу асн. сіл. Жыве на радзіме.

ЖАЛАБЫ ГЛЫБАКАВОДНЫЯ, вялікія формы рэльефу дна акіяна, элемент структуры сучасных геасінкліпальных абласцей. Вызначаюцца сейсмічнай вобласці акіяна з адмоўнымі гравітацыйнымі анамаліямі і з паніжанымі значэннямі цеплавога патоку.


Доўгія (да некалькіх тысяч кіламетраў) і вузкія ўпадзіны V-падобнай формы, шыр. 30—90 км (па дне 1—8 км), глыб. ад 6 да 8—11 км, схілы маюць стромкасць 4—10°, часам да 30—45°. Дно плоскае або слаба хвалістае, укрытае рыхлымі асадкамі магутнасцю да некалькіх соцень метраў. Размешчаны звычайна на ўскраіне акіянаў, уздоўж гарыстых узбярэжжаў або аблямоўваюць з вонкавага боку астраўныя дугі, зрэдку — унутры геасінклінальных морaў. У Ціхім ак. налічваюць 22 Ж. г., у Атлантычным 3, у Індыйскім 1. Найб. глыбокія — у Ціхім ак.: Марыянскі 11 022 *м*, Тонга 10 882 *м*, Курыла-Камчацкі 10 542 *м*.

Літ.: Леонтьев О. К. Дно океана, М., 1968; Окраины континентов и островные дуги, пер. с англ., М., 1970.

ЖАЛЕЗА (Ferrum), Fe, хімічны элемент VIII групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева. Ат. н. 26, ат. м. 55,847. Складаецца з 4 стабільных ізатопаў: ^{54}Fe (5,84%), ^{56}Fe (91,68%), ^{57}Fe (2,17%) і ^{58}Fe (0,31%).




1



2




3



4

Жалезабетонныя канструкцыі.


1. Жалезабетонныя дэталі перад адпраўкай на будоўлю.
2. Будаўніцтва цэха з тыпавых жалезабетонных канструкцый.
3. Кароўнік са зборных жалезабетонных канструкцый у Віцебскай вобл.
4. Цэх жалезабетонных трубаў у Мінску.
5. Цэх вытворчасці пліт перакрыцця ў Баранавічах.
6. Каркасна-панельны будынак інстытута «Белпрампраект» у Мінску (стадыя будаўніцтва).





5




6


1


2


3


4



5


6


Жывёлагадоўля.

1. Статак на пашы. Калгас «Памяць Леніна» Клецкага раёна Мінскай вобласці.
2. Ферма зверасаўгаса «Беларускі» Вілейскага раёна Мінскай вобласці.
3. Васьмірадны валоўнік у саўгасе «Пратасаўшчына» Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці.
4. Культурная паша Магілёўскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі.
5. Пульт кіравання вытворчымі працэсамі на свінаферме калгаса «Рассвет» імя Арлоўскага Краўскага раёна Магілёўскай вобласці.
6. Смалявіцкая бройлерная птушкафабрыка Мінскай вобласці.




1


3



2



4



5



6


Жалезны век I. 1. Сякера. 3—1 ст. да н. э., в. Аўгустова Лепельскага раёна. 2. Сякера з рога лася. 3—1 ст. да н. э., в. Лабеншчына Мінскага раёна. 3. Долатападобная прылада працы. 2—4 ст., в. Лабеншчына. 4. Наканечнік дроціка. 3—1 ст. да н. э., в. Аўгустова. 5. Наканечнік кап'я. 1 ст. да н. э.— 1 ст. н. э., в. Чаплін Лоеўскага раёна. 6. Наканечнік стралы. 7—8 ст., в. Язна Міёрскага раёна. 7. Жалезны нож з бронзавай ручкай. 2—1 ст. да н. э., в. Чаплін. 8. Серп. 5—7 ст., в. Гарадзішча Мядзельскага раёна. 9. Іголка. 5—7 ст., в. Лабеншчына. 10. Шпілька. 1—4 ст., гарадзішча Буракова Гарадоцкага раёна (усе ў Дзяржаўным музеі БССР). 11. Дэталь конскай зброі. 4—1 ст. да н. э., в. Гарошкаў Рэчыцкага раёна (Рэчыцкі краязнаўчы музей). 12. Шпора. 5—7 ст., в. Гарадзішча Мядзельскага раёна. 13. Прасліца. 2 ст. да н. э., в. Чаплін. 14. Тыгель. 2—5 ст., в. Адаменка Быхаўскага раёна (усе ў Дзярж. музеі БССР).



7


8


9



10


11


12


13


14



Жалезны век II. 1. Пацеркі. 4—1 ст. да н. э., в. Ґарошкаў (Рэчыцкі краязнаўчы музей). 2. Бронзавае кольца. 3—1 ст. да н. э., в. Чаплін. 3. Бронзавая накладка. 4—5 ст., в. Лабеншчына. 4. Бронзавая фібула. 3—4 ст., в. Малышкі Вілейскага раёна. 5. Бронзавы бранзалет. 2—4 ст., в. Збаравічы Мінскага раёна. 6. Падвеска з ланцужком. 5—8 ст., в. Язна (усе ў Дзяржаўным музеі БССР). 7. Скроневае кольца. 4—2 ст. да н. э., в. Багушэвічы Бярэзінскага раёна. 8. Бронзавы бранзалет. 5—7 ст., в. Тайманава Быхаўскага раёна (усе ў Інстытуце гісторыі АН БССР). 9—11. Сярэбраныя ўпрыгожанні з чырвонай эмаллю. 4—5 ст., в. Красны Бор Лагойскага раёна (Гісторыка-этнаграфічны музей Літ. ССР, г. Вільнюс).

З штучных ізатопаў найб. выкарыстоўваюцца ^{55}Fe і ^{59}Fe. У хім. злучэннях асн. валентнасці Ж. II і III (радзей — VI). Чыстае Ж.— серабрыста-белы вязкі і коўкі метал; шчыльнасць 7874 *кг/м*³, *t* пл. 1539 °С, *t* кіп. 2880 °С. Вядомыя тры алатрапічныя формы крышталяў Ж.: α-Ж. (аб'ёмнацэнтраваная рашотка, існуе ад нізкіх т-р да 910 °С), γ-Ж. (гранецэнтраваная рашотка, існуе ў інтэрвале т-р 910—1400 °С), δ-Ж. (рашотка, як і ў α-Ж., існуе пры т-ры вышэй за 1400 °С). Да 769 °С Ж. ўласцівы *ферамагнетызм*, у інтэрвале 769—910 °С — *парамагнетызм*. Ж. лёгка акісляецца, у вільготным паветры ржавее. Растваральнасць у водных растворах кіслот, а шчолачах не рэагуе. Вядомае з старажытных часоў. У зямной кары 5,1% Ж. па масе; яно ўваходзіць у састаў многіх мінералаў, а іх утвараюцца радовішчы жал. рудаў. Чыстае Ж. атрымліваюць электролізам водных раствораў соляў, тэрмічным раскладаннем у вакууме пентакарбанілу Ж., непасрэдным узнаўленнем з рудаў.


У тэхніцы Ж. выкарыстоўваецца пераважна ў выглядзе сплаваў (гл. *Жалезныя сплавы, Жалезавугляродзістыя сплавы*). Асн. функцыя Ж. ў раслінных і жывёльных арганізмах — удзел у працэсах акіслення і кіслароднага абмену. Большая частка Ж. ў целе чалавека знаходзіцца ў *гемаглабіне*.

Літ.: Технически чистое железо, М., 1962; Волков В. Л., Сыркин В. Г. и Толмасский И. С. Карбонильное железо, М., 1969; Восстановление и рафинирование железа, М., 1968.


ЖАЛЕЗАБЕТО́Н, памоцнены стальной арматурай *бетон*; спалучэнне бетону і арматуры, якія працуюць у канструкцыі як адно цэлае. Тэрмін Ж. часта ўжываецца як назва жалезабетонных канструкцый, дэталяў і інш.

Прынята лічыць, што вынаходнік Ж.— парыжскі садоўнік Ж. Манье, які атрымаў патэнт на дзежку для кветак, зробленую з цэментавага раствору і каркаса з метал. сеткі. Яго суайчыннік Ж. Л. Ламбо зрабіў лодку (1855) з тых жа матэрыялаў. Канструкцыі з Ж. хутка пашырыліся ў многіх краінах, у т. л. ў Расіі. У 1901—02 толькі на чыг. лініі Віцебск — Жлобін было пабудавана з Ж. 27 мастоў і шляхаправодаў. Значны ўклад у развіццё навукі пра Ж. зрабілі рус. і сав. вучоныя М. А. Белялюбскі, А. Ф. Лалейт, Р. П. Перадзеры, В. В. Міхайлаў, А. А. Гвоздзеў.

Бетон добра супраціўляецца сцісканню, але мае значны недахоп — слабае супраціўленне расцягванню. Гэты недахоп кампенсуецца ўжываннем *арматуры*. У канструкцыях з Ж. бетон прызначаны ўспрымаць сціскальныя ўнутраныя намаганні, а стальная арматура — пераважна расцягвальныя. Пры ацвярдзенні сумесі паміж бетонам і арматурай утвараецца трывалая сувязь (счапленне) з-за клейкасці цэментавага раствору і ўсадкі бетону. Выкарыстанне арматуры перыяд. профілю, кручанай і інш., замацаванне крукоў і анкераў павышае сувязь арматуры з бетонам і паляпшае іх сумесную работу. Размяшчэнне арматуры ў элементах жалезабетонных канструкцый праектуецца ў залежнасці ад віду дэфармацыі. У згінальных элементах адрозніваюць рабочую арматуру — падоўжныя стрыжні (асн. арматура), косыя (нахіленыя) і папярочныя (хамуты), а таксама мантажную арматуру (гл. рыс. 1). Падоўжныя стрыжні размяшчаюцца ў адзін ці некалькі радоў у расцягнутай зоне на адлегласці не менш за 1—2,5 см ад паверхні. Часта падоўжная арматура ставіцца і ў сціснутай зоне (каб павялічыць нясучую здольнасць бэлькі без павелічэння яе сячэння). Пліты, якія апіраюцца па двух баках (бэлькавыя пліты), арміруюцца, як і бэлькі, але яшчэ дадаецца размеркавальная арматура (укладваецца ўпоперак асн. рабочай арматуры). Пліты, абапёртыя па контуры, маюць рабочую арматуру ў абодвух кірунках. У сціснутых элементах (калонах, стрыжнях фермы) падоўжная арматура размяшчаецца паблізу паверхні элемента сіметрычна (рыс. 2) і звязваецца папярочнымі стрыжнямі (хамутамі) ці спіральнай арматурай. Арміраванне папярэдне напружанага Ж. адрозніваецца ад звычайнага тым, што арматура знаходзіцца ў штучна нацягнутым стане. Выкарыстанне высокатрывалай папярэдне напружанай арматуры скарачае расход сталі да 40—50% і бетону да 10—20%, павышае шчыльнаўстойлівасць, паляпшае пругкія ўласцівасці канструкцый, павялічвае жорсткасць і воданепранікальнасць.



Рыс. 2. Схема калоны з вязаным арматурным каркасам: *1* — асноўная рабочая арматура; *2* — папярочная арматура.



Рыс. 1. Схема бэлькі з вязаным арматурным каркасам: *1* — асноўная рабочая арматура; *2* — хамуты; *3* — мантажная арматура.

Літ.: Гл. пры арт. *Жалезабетонныя канструкцыі*. *М. Ц. Архіпец.* Мінск.

ЖАЛЕЗАБЕТО́ННЫЯ КАНСТРУ́КЦЫІ, будаўнічыя канструкцыі з бетону і стальной арматуры *(жалезабетону)*.

Адрозніваюць маналітныя Ж. к., якія ўзводзяцца як адно цэлае на месцы збудавання, аборныя, якія робяцца на заводах і палігонах, і аборна-маналітныя. Пры масавым буд-ве значнае пашырэнне набыў аборны жалезабетон (напр., у будынках з *буйнапанельных канструкцый*). Зборны жалезабетон значна зніжае затраты працы на буд-ва, памяншае расход лесаматэрыялаў і сталі, скарачае тэрміны буд-ва. З жалезабетону можна рабіць канструкцыі розных формы і надаваць збудаванням архітэктурнае аблічча, што не даслягаецца інш. матэрыяламі. Пашыраны ва ўсіх галінах буд-ва (прамысловым, жыллёва-грамадскім, транспартным, гідратэхнічным), ужываецца таксама ў суднабудаванні, станкабудаванні (станіны). Збудаванні з жалезабетону даўгавечныя, маюць высокую нясучую здольнасць, сейсмаўстойлівыя, вогнетрывалыя. Гл. таксама *Будаўніцтва, Будаўнічая індустрыя*. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Сахновский К. В. Железобетонные конструкции, 8 изд., М., 1961; Михайлов В. В. Предварительно напряженные железобетонные конструкции, М., 1963; Ахвердов И. Н. Железобетонные напорные центрифугированные трубы, М., 1967; Дрозд Я. И. Предварительно напряженные железобетонные конструкции. Мн., 1964; Леванов Н. М. и Суворкин Д. Г. Железобетонные конструкции, М., 1965; Караваев Г. А. и Михайлов К. В. Современные железобетонные конструкции в США, М., 1966; Справочник по производству сборных железобетонных изделий, т. 1—2, М., 1965. *М. Ц. Архіпец.* Мінск.

ЖАЛЕЗАВУГЛЯРОДЗІСТЫЯ СПЛАВЫ, сплавы жалеза з вугляродам на аснове жалеза.

Вывучаны Ж. с., у якіх вугляроду да 6—7%; у тэхніцы пашыраны Ж. с., у якіх да 4,5% вугляроду. Адрозніваюць т. зв. чыстыя Ж. с., якія атрымліваюць у невялікай колькасці для навукова-даследчых мэт, і тэхнічныя — *сталь* і *чыгун*. Акрамя жалеза і вугляроду ў Ж. с. ёсць карысныя (марганец, крэмній) і шкодныя (фосфар, сера і інш.) дамешкі. Структура, мех. і фіз.-хім. ўласцівасці Ж. с. залежаць ад хім. саставу, а таксама ад умоў іх крышталізацыі і тэрмічнай апрацоўкі. Веданне ўласцівасцей чыстых Ж. с. і іх *дыяграмы стану* — аснова навукі пра сталь і чыгун.

Літ.: Григорович В. К. Электронное строение и термодинамика сплавов железа, М., 1970; Вертман А. А. и Самарин А. М. Методы исследования свойств металлических расплавов, М., 1969; Тыркель Е. История развития диаграммы железо — углерод, пер. с польск., М., 1968; гл. таксама літ. пры арт. *Жалезныя сплавы.*

ЖАЛЕЗНАВОДСК, бальнеалагічны курорт з групы *Кайказскіх мінеральных водаў*, за 19 *км* ад Пяцігорска, 21 *км* ад ст. Мінеральныя Воды і 6 *км* ад ст. Бештау.

Першыя мінер. крыніцы ў Ж. адкрыў рус. ўрач Ф. П. Гааз (1810). Асн. лекавы фактар — мінер. крыніцы з вуглякіслымі гідракарбанатна-сульфатна-натрыева-кальцыевымі водамі, блізкімі да водаў курорта *Карлавы-Вары*, і радонава-радыевымі водамі. Воды выкарыстоўваюць для ваннаў і пітнога лячэння. Пашыраны лячэнне гразёю Тамбуканскага возера і клімататэрапія. Клімат горна-лясны з паніжаным атм. ціскам (710 *мм*, ці 94,6 *кн/м*²), павышанай вільготнасцю, цёплае лета. Сонечна 1770 гадзін у год. У Ж. 12 санаторыяў. Лечаць хворых з хранічнымі пашкоджаннямі стрававальна-кішачнага тракту, нырак, печані, мочавыдзяляльных шляхоў нетуберкулёзнага паходжання, з парушэннямі абмену рачываў. Сезон увесь год.

Літ.: Курорты СССР, М., 1962; Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967.

ЖАЛЕЗНІКАЎ Карп Апанасавіч [1(13).10.1895, г. Орша — 16.11.1957], удзельнік грамадз. вайны, геп.-м. (1940). З рабочых. Чл. КПСС з 1939. Скончыў курсы ўдасканалення каманднага саставу (1931). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з жн. 1918. З сак. 1918 у ўпраўленні Аршанскай пав. міліцыі, у Аршанскім і Лёзненскім ваенкаматах. У жн. 1919 — ліст. 1920 ваяваў на Паўд.-Зах. фронце супраць Дзянікіна, на Заходнім супраць войск ген. Булак-Балаховіча. З 1921 у Аршанскім пав. ваенкамаце, у часцях БВА; з 1939 камандзір дывізіі. У Айч. вайну на Паўн.-Зах. фронце. З 1943 нач. ваен. вучылішчаў, з 1950 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

ЖАЛЕЗНЫ ВЕК, апошняя (пасля каменнага і бронзавага вякоў) археал. эпоха ў гісторыі чалавецтва, якая характарызуецца пашырэннем металургіі жалеза і вырабам жалезных рэчаў. Жалеза пашырылася пазней за інш. металы (медзь, бронзу, волава), бо ў чыстым выглядзе бывае рэдка, а выплаўляць з жал. рудаў яго вельмі цяжка (тэмпература плаўлення 1528 °С). Асобныя рэчы з чыстага (метэарытнага) жалеза былі вядомыя яшчэ ў 4—3-м тысячагоддзях да н. э. Ж. в.— кароткая археал. эпоха ў параўнанні з каменным і бронзавым вякамі. Яго храналагічныя рамкі ад 9—7 ст. да н. э., калі большасць плямёнаў Еўропы і Азіі пачала здабываць і апрацоўваць жалеза, да ўзнікнення ў іх класавага грамадства і дзяржаў.

У Зах. Еўропе ён падзяляецца на гальштацкі, латэнскі і рымскі перыяды. Ранняму Ж. в. характэрны пераход ад бронзы да жалеза. *Гальштацкая культура* была пашырана на тэр. Аўстрыі, Югаславіі, Паўд. Германіі, Паўд.-Зах. Чэхаславакіі, Паўн. Францыі. Блізкая да гальштацкай была культура франкійскіх плямёнаў, якія жылі на У Балканскага п-ва. На Пірэнейскім п-ве была пашырана іберыйская культура, у бас. Віслы і Одэра *лужыцкая культура. Латэнскай культуры* характэрна поўная перавага жал. прылад працы і зброі. На тэрыторыях, заваяваных Рымам, узнікла правінцыяльная рымская культура, паміж Паўночным м., Рэйнам, Дунаем і Эльбай — культура германскіх плямёнаў, на У ад Одэра і Эльбы — *пшэворская культура*, якую даследчыкі звязваюць са слав. плямёнамі *венедаў*. У канцы Ж. в. ў славян і германцаў узнікаюць дзяржавы. На тэр. СССР пачатак Ж. в. прыпадае на 10—9 ст. да н. э. Найб. раннія жал. рэчы знойдзены ў Закаўказзі, на Ніжняй Волзе і Паўночным Каўказе, у 8—7 ст. да н. э. жалеза пашыраліся ўсюды, акрамя таежных і тундравых раёнаў Сібіры і Пн Еўропы, дзе яно паявілася толькі ў 1-м тысячагоддзі н. э. У 7 ст. да н. э. ў стэпах Паўн. Прычарнамор'я ўзнікла скіфская культура; скіфы будавалі ўмацаваныя цэнтры, дзе побач з інш. рамёствамі была развіта металургія жалеза (гл. *Каменское гарадзішча*). Паміж Дунаем і Уралам у 8—3 ст. да н. э. жылі блізкія да скіфаў па мове і культуры *сарматы*, у канцы 3 ст. да н. э. яны пашырылі сваё панаванне на Паўн. Прычарнамор'е. У 2 ст. н. э. на тэр. Правабярэжнай Украіны сарматаў змянілі плямёны *чарняхоўскай культуры*, Левабярэжнай Украіны і на Доне — аланы. У Волга-Камскім бас., правабярэжжы Волгі, на верхняй Волзе і Волга-Окскім міжрэччы жылі плямёны ананьінскай, п'янаборскай, гарадзецкай культур, *дзякоўскай культуры.*

Некат. вучоныя лічаць, што спосаб здабычы жалеза з рудаў у сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. вынайшлі падначаленыя хетам плямёны, якія жылі ў гарах Арменіі. У 15 ст. да н. э. жалеза апрацоўвалі ў Месапатаміі і Егіпце, у 12—11 ст. да н. э. ў краінах Міжземнамор'я і ў Індыі, у 10—8 ст. да н. э. ў Зах., Цэнтр. і Усх. Еўропе. Жалеза здабывалася з бурага жалезняку сыradутным спосабам, г. зн. шляхам аднаўлення вугляродам пры тэмпературы 700—1200 °С. Адноўленае жалеза асядала на дно доменнай печы (домніцы) у выглядзе порыстай масы — *крыцы*, якую пазней пяраз праграваді, пракоўвалі. З гатовых балванак выраблялі розныя прылады працы, бытавыя рэчы і зброю. Жалеза адыграла вял. ролю ў развіцці прадукцыйных сіл, вробленыя з яго прылады працы былі значна мацнейшыя за каменныя і бронзавыя. Узнікаюць умовы для атрымання прыбавачнага прадукту і накаплення матэрыяльных каштоўнасцей спачатку ў родзе, потым у асобных сем'ях. Паяўляецца маёмасная нераўнасць. Паглыбляецца распад першабытнаабшчынных адносін, абвастраюцца супярэчнасці паміж родамі і плямёнамі. Вайна дзеля рабавання і эксплуатацыі заваяваных плямёнаў становіцца звычайнай з'явай, узнікае патрыярхальнае рабства. Разам з тым развіваецца міжплемянны абмен, ён спрыяе ўзнікненню прыватнай уласнасці, класаў і дзяржавы.

На тэр. Беларусі Ж. в. прыпадае на 7—6 ст. да н. э.— 8 ст. н. э., перыяд да 4 ст. н. э. называюць раннім Ж. в. Жалеза здабывалася з бурага жалезняку ў невялікіх паўшарападобных печах (домніцах), якія знойдзены пры раскопках гарадзішчаў *Лабенщчына* (каля Заслаўя), *Церабкунь* (каля Суража), Свідна (Лагойскі р-н) і інш. Існавалі спец. жалезаробчыя майстэрні, у якіх здабывалі жалеза і выраблялі з яго рэчы і зброю (гл. *Бураковa*). Першыя з жалезам пазнаёміліся плямёны *мілаградскай культуры*, якія жылі ў бас. Прыпяці, у Бел. Падняпроўі і на Пн тэр. Украіны; на З ад Гарыні плямёны *паморскай культуры.* У 3—2 ст. да н. э.— 2—5 ст. н. э. на гэтай тэр. жылі плямёны *зарубінецкай культуры*, якую большасць даследчыкаў лічыць раннеславянскай. Тэрыторыю Цэнтр. Беларусі і Усх. Літвы засялялі плямёны *штрыхаванай керамікі культуры*, а Паўн. Беларусі і суседнія тэр. Смаленскай і Пскоўскай абл.— плямёны *днепра-дзвінскай культуры.* Здабываць і выкарыстоўваць жалеза яны пачалі не раней як у 5—4 ст. да н. э., да гэтага ўжывалі прылады працы і зброю з косці і крэменю. Да 6 ст. н. э. на Пд тэр. Беларусі, Пн Украіны і ў Цэнтр. Еўропе пашырылася *пражская культура*, якая належала славянам, на цэнтр. і паўн. частку Беларусі, паўд. р-ны Пскоўскай і зах. Смаленскай абл.— розныя раннесярэдневяковыя культуры, у т. л. тыпу верхняга пласта *Банцараўшчыны.* У 7—8 ст. н. э. на тэр. Беларусі сфарміраваліся ўсх.-слав. плямёны — *дрыгавічы, крывічы, радзімічы*, у 9 ст. ва ўсх. славян узнікла дзяржава. Гл. карту і іл. на ўклейках.

Літ.: Энгельс Ф. Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 2, Мн., 1952; Авдусин Д. А. Археология СССР, М., 1967; Загорульский Э. М. Археология Белоруссии, Мн., 1965; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970; Третьяков П. Н. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге, М.— Л., 1966; Кухаренко Ю. В. Средневековые памятники Полесья, М., 1961; Ягодинская Г. Зарубинецкая культура, М., 1964; Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья, М., 1970; Мельниковская О. Н. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке, М., 1967; Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья, М.— Л., 1962; Поболь Л. Д. Древности Туровщины, Мн., 1969; Лыдзанскі А. М. і Палікарповіч К. М. Да гісторыі жалезнай прамысловасці на Беларусі па данных археалогіі, «Савецкая краіна», 1932, № 5.

А. Р. Мітрафанаў, Л. Д. Побаль. Мінск.

ЖАЛЕЗНЫ КАПЯЛЮШ, верхняя акісленая частка рудных, пераважна сульфідных радовішчаў каляровых металаў.

Утвараецца пры выхадзе пакладаў на зямную паверхню ў працэсе хім. выветрывання. Складзены пераважна з аксіслаў і гідраксіслаў жалеза, якія надаюць яму чырвона-буры колер. Часам абагачаецца золатам. Ж. к.— важны крытэрый для пошуку медна-калчаданавых радовішчаў, крыніца здабычы *малахіту.*

ЖАЛЕЗНЫЯ ВОХРЫ, парашкападобныя мінеральныя ўтварэнні, якія ўзнікаюць пры выветрыванні жалезістых мінералаў. Гл. *Вохры.*

ЖАЛЕЗНЫЯ РУДЫ, мінер. агрэгаты, якія змяшчаюць жалеза ў выгаднай для здабычы колькасці. Каштоўнасць залежыць ад колькасці жалеза і прымесяў, ад мінералагічнага саставу, ад мех. якасцей, ад узроўню тэхналогіі выплаўкі чыгуну і інш. Гал. рудаўтваральныя мінералы — *магнетыт, гематыт*, гётыт, *ліманіт, сідэрыт*, радзей — шамазіт, цюрынгіт.

Тыпы Ж. р. вылучаюць у залежнасці ад пераважнай колькасці аднаго рудната мінералу ці комплексу іх (гл. *Руды жалязняк*). Каштоўныя прымесі: марганец, хром, нікель, ванадый, медзь, кобальт; шкодныя — сера, фосфар, мыш'як, цынк, свінец. Распрацоўваюцца руды з 25% жалеза, у плаўку ідзе абагачаны да 60—70% канцэнтрат (гл. *Абагачэнне карысных выкапняў. Агламерацыя*). Паводле паходжання радовішчы Ж. р. падзяляюцца на эндагенныя, экзагенныя і эфузіўна-асадкавыя. Формы пакладаў — штокавыя, жылападобныя, пластавыя, украпанікавыя і інш. Найб. радовішчы ў СССР: Курская магн. анамалія, Крыварожскі жалезарудны басейн, на Урале, у Усх. Сібіры, у Казахстане; за мяжою — у Кітаі, Бразіліі, Індыі, Канадзе, ЗША, Аўстраліі і інш. На Беларусі Ж. р. выяўлены ў пародах крышталічнага фундаменту 7 зах. ч. рэспублікі (Шчучын, Карэлічы, Столбцы). Руды магнетыт-ільменітавага саставу ці накшталт магнетытавых кварцытаў.

Ж. р. выкарыстоўваюцца пераважна для выплаўкі чыгуну, сталі і ферасплаваў. Сусв. запасы Ж. р. каля 4000 млрд. *т*, здабыча (у пераліку на метал) — каля 368 млн. *т* (1968). Па запасах і здабычы Ж. р. СССР займае 1-е месца ў свеце (запасы каля 40% сусветных, здабыча 196 млн. *т* у 1970).

Літ.: Лазаренко Е. К. Курс минералогии, 2 изд., М., 1971; Браун Г. А. Железорудная база черной металлургии СССР, 2 изд., М., 1970; Железорудные месторождения мира, т. 1—2, пер. с англ. и др., М., 1955.

І. Д. Несцяровіч. Мінск.

ЖАЛЕЗНЫЯ СПЛАВЫ, металічныя сплавы, асноўным кампанентам якіх з'яўляецца *жалеза.* Жалеза ўтварае сплавы з большасцю элементаў, за выключэннем шчолачных і шчолачна-зямельных металаў, а таксама серабра, ртуці, талію, свінцу і вісмуту.


З металамі VIII групы перыяд. сістэмы Мендзялеева, крышталічная рашотка якіх падобна да рашоткі жалеза (кобальт, нікель, паладый, плаціна, ірыдый і родый), жалеза ўтварае бесперапынныя цвёрдыя растворы, што крышталізуюцца з кубічнай гранецэнтраванай рашоткай. Такія ж сплавы ўтвараюцца і з марганцам (VII група). Блізкія па ўласцівасцях да жалеза хром (VI група) і ванадый (V група) утвараюць з жалезам бесперапынныя цвёрдыя растворы з кубічнай аб'ёмнацэнтраванай рашоткай. З некат. металамі жалеза можа ўтвараць трайныя і чацвярныя растворы (напр., у сістэме Fe—Co—Ni). У прыродзе Ж. с. трапляюцца параўнаўча рэдка; да прыродных Ж. с. належаць жал. метэарыты (складаюцца з жалеза і нікелю) і самародная плаціна, у якой часта ёсць значная колькасць жалеза. Прамысловыя Ж. с.: *жалезавугляродзістыя сплавы, ферасплавы*, а таксама Ж. с. (пераважна з нікелем), якія маюць асаблівыя ўласцівасці, напр. высокае эл. супраціўленне, адмоўны ці блізкі да нуля каэф. лінейнага пашырэння і інш.

Літ.: Бочвар А. А. Металловедение, 5 изд., М., 1956; Железные сплавы, т. 1—3, М.— Л., 1945—56; Дмитровіч А. М. Металлы в машиностроении, Мн., 1956.

ЖАЛЕЗНЯКОВІЧ Павел Арсенавіч [н. 27.9 (10.10).1906, в. Лешня Слуцкага пав. Мінскай губ.], дзеяч рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі. З сям'і свяшчэнніка. Чл. КПСС з 1924. З 1923 на падпольнай рабоце ў Зах. Беларусі. За паліт. дзейнасць 17.9.1926 арыштаваны і 15.5.1928 засуджаны на пажыццёвае турэмнае зняволенне. Пасля вызвалення Зах. Беларусі Чырв. Арміяй удзельнічаў ва ўстанаўленні Сав. ўлады ў Стаўбцоўскім пав. З пачатку Айч. вайны ў сав. тыле, з ліст. 1942 у партызанах. З ліп. 1944 старшыня Мірскага райвыканкома, з 1949 першы сакратар Мірскага, з 1952 Любчанскага, з 1956 Карэліцкага РК КПБ; у 1963—68 старшыня Карэліцкага пас. Савета. На XXIII—XXV з'ездах КПБ выбіраўся чл. Рэвіз. камісіі. Дэп. Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Карэлічах.

Літ.: Брыль Я. Сэрца камуніста, Мн., 1957.

ЖАЛЕЙКА, беларускі і рускі духавы музычны інструмент; драўляная трубка з адзі-



парнай трысцінкай (пішчыкам) і галасавымі адтулінамі (пераважна з шасцю), якая канчаецца раструбам з бярозы або з каровінага рога. На Беларусі адзін з асн. традыцыйных нар. інструментаў.

ЖАЛІГОЎСКІ (Zeligowski) Эдвард Вітольд (псеўд. Антон Савá; 20.7.1816, маёнтак Мар'янполле Вілейскага пав. Мінскай губ.— 28.7.1864), польскі паэт рэвалюцыйна-дэмакр.

кірунку, рэвалюцыйны дзеяч. Вучыўся (1833—36) у Дэрпцкім ун-це, дзе быў інтэрніраваны па справе рэвалюцыянера Ш. *Канарскага*. У 1842 вярнуўся на радзіму. У 1850 за ўдзел у вызв. руху сасланы ў Петразаводск, потым у Арэнбург. З 1858 у Пецярбурзе, з І. Агрызкам выдаваў час. «Słowo» («Слова», 1859). З 1860 за мяжою, супрацоўнічаў у польскім рэвалюц. друку. Аўтар антыпрыгонніцкай вершаванай драмы «Іардан» (1846), драмы «Зорскі» (неапубл.). Сябраваў з Т. Шаўчэнкам. Прысвяціў яму верш «Да народнага паэта», чытаў у рукапісе «Зорскага». З яго Шаўчэнка выкарыстаў у «Перайманні Эдуарда Савы» бел. нар. песню «Пасаджу я ля хаціны». У нарысах «Сёння і ўчора» (т. 1—2, 1858) пісаў пра галечу бел. сялян, пра В. Дуніна-Марцінкевіча. Перапісваўся з А. Вярыгам-Дарэўскім.

Тв.: Poezye, Petersburg, 1858.

Літ.: Мартынава Э. і Мальдзіс А. Шаўчэнка і Жалігоўскі, у кн.: Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура, Мн., 1964; Pisarek H. Ateizm rewolucyjnego demokraty Edwarda Żeligowskiego, «Euhemer», 1964, № 5. *А. І. Мальдзіс.* Мінск.

ЖАЛІО-КЮРЫ (Joliot-Curie) Ірэн (12.9.1897, Парыж — 17.3.1956), французскі фізік, прагрэс. грамадская дзеячка. Праф. Парыжскага ун-та (з 1934). Чл. навук. т-ваў і ўстаноў шэрагу краін, чл.-кар. АН СССР (з 1947). Дачка П. *Кюры* і М. *Складоўскай-Кюры*. Асп. навук. працы па радыехіміі і фізіцы атамнага ядра. З мужам Ф. *Жаліо-Кюры* адкрыла (1934) з'яву штучнай радыеактыўнасці (Нобелеўская прэмія 1935). Выявіла ў некаторых штучна атрыманых радыеактыўных рэчывах новы тып радыеактыўнасці — пазітронную радыеактыўнасць. У 1940—44 удзельніца Руху Супраціўлення, пазней — Руху прыхільнікаў міру. Была чл. Пастаяннага камітэта Сусв. кангрэсу прыхільнікаў міру і чл. Сусв. Савета Міру.



Тв.: Рус. пер.— Жолио-Кюри Ф. Избр. тр.— Фредерик и Ирен Жолио-Кюри. Совместные тр., М., 1957 (бібліягр.).

Літ.: Ирен и Фредерик Жолио-Кюри. Реком. список лит., М., 1963.

ЖАЛІО-КЮРЫ (Joliot-Curie) Фрэдэрык (19.3.1900, Парыж—14.8.1958), французскі фізік, прагрэс. грамадскі дзеяч. Чл. Парыжскай АН (з 1943) і многіх АН замежных краін, замежны чл. АН СССР (з 1947). Чл. ФКП з 1942. Асп. навук. працы па фізіцы атамнага ядра. У 1934 з І. *Жаліо-Кюры* адкрыў з'яву штучнай радыеактыўнасці (Нобелеўская прэмія 1935). Атрымаў шэраг новых радыеактыўных ізатопаў і вывучаў спосабы іх практ. выкарыстання. Даследаваў прыроду нейтрона, вывучаў ланцуговыя ядз. рэакцыі. Актыўны ўдзельнік Руху Супраціўлення, а ў пасляваенныя гады — Руху прыхільнікаў міру. З 1949 старшыня Пастаяннага камітэта Сусв. кангрэсу прыхільнікаў міру, з 1951 старшыня Сусв. Савета Міру. Міжнар. Ленінская прэмія «За ўмацаванне міру паміж народамі» за 1951.

Тв.: Рус. пер.— Избр. тр.— Фредерик и Ирен Жолио-Кюри. Совместные тр., М., 1957 (бібліягр.).

Літ.: Кузнецов Б. Г. Фредерик Жолио-Кюри — ученый и борец за мир, М., 1952; Шаскольская М. Жолио-Кюри, М., 1966 (Жизнь замечательных людей); Бикар П. Фредерик Жолио-Кюри и атомная энергия, пер. с франц., М., 1962; гл. таксама літ. пры арт. *Жаліо-Кюры* І.


ЖАЛІЎЕ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 12 *км* на Пн ад Чавусаў, 60 *км* ад Магілёва, 16 *км* ад чыг. ст. Чавусы, на аўтамаб. дарозе Чавусы—в. Будзіна. 162 ж., гасп. 57 (1971). Сепаратарны пункт, швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, 2 магазіны. У 1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 116 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖАЛКЕЎСКІ, Жулкеўскі (Zółkiewski) Станіслаў (1547—7.10.1620), польскі дзярж. і ваен. дзеяч, вялікі каронны гетман (з 1613), канцлер (з 1617). У 1596 задушыў казацка-сялянскае паўстанне пад кіраўніцтвам С. Налівайкі на Украіне і шляхецкі бунт супраць караля Зыгмунта III (1607). У час польскай і шведскай інтэрвенцыі ў Рускую дзяржаву пач. 17 ст. разбіў пад Клушынам (24.6.1610) войска Дзмітрыя Шуйскага, увайшоў у Маскву (4.7.1610). У апошнія гады жыцця абараняў паўд. граніцы Рэчы Паспалітай. Удзельнік вайны з Турцыяй (1620).

ЖАЛО́НЬ, рака, правы прыток р. Славечны (бас. Прыпяці). Даўж. 65 *км*. У 1961 воды Ж., якая раней упадала ў Прыпяць, накіраваны па Свячанскім канале ў Славечну. Цячэ пераважна па Палескай нізіне, у вытоках — па Оўруцкім кражы ў межах Оўруцкага р-на Жытомірскай вобл. УССР; на тэр. БССР — у Ельскім і Нараўлянскім р-нах Гомельскай вобл. Вадазбор (607 *км*²) — раўніна, складзеная з водналедавіковых і алювіяльных адкладаў. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2,30 *м*³/*сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ЖАЛТО́ЎСКІ Іван Уладзіслававіч [15(27).11.1867, Пінск — 16.7.1957], рускі савецкі архітэктар і педагог. Засл. дз. нав. і маст. РСФСР (1932), засл. дз. маст. БССР (1944), правадз. чл. Акадэміі арх. (1939—56) і Акадэміі буд-ва і арх. (з 1956), ганаровы акад. АН БССР (з 1947). Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1887—98); з 1909 акадэмік архітэктуры. Выкладаў у вышэйшых маст. навуч. установах Масквы, Ін-це аспірантуры АА СССР. Узначальваў арх. майстэрню-школу Ін-та

Маспраект (1953—59). У творчасці ўжываў кампазіцыйныя прыёмы і элементы класічнай архітэктуры, асаблівую ўвагу аддаваў прапорцыям, рытму. Сярод работ: дом б. Скакавога т-ва (1903—05), б. асабняк Тарасава (1910), праект рэканструкцыі Масквы (1918—23), ген. план і шэраг пабудоў Усерасійскай с.-г. і саматужна-прамысл. выстаўкі (1923), жылыя дамы на праспектах Маркса (1933—34), Міру (1957), на Смаленскай пл. (1950), на Ленінскім праспекце (1949, Дзярж. прэмія СССР 1950; усе ў Маскве), павільён СССР на Міжнар. выстаўцы ў Мілане (1925—26), тыпавыя праекты для індустрыяльнаэборнага буд-ва жылых дамоў і кінатэатраў. У 1941 пад кіраўніцтвам Ж. распрацаваны першы праект драм. т-ра ў Гомелі. Прапановы Ж. былі прыняты пры стварэнні першага пасляваеннага генплана Гомеля. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



Літ.: И. В. Жолтовский, М., 1955.

ЖАЛУДО́К, гар. пасёлак (з 1940) Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. За 22 *км* на У ад Шчучына, 90 *км* ад Гродна, 7 *км* ад чыг. ст. Жалудок. 2,1 тыс. ж. (1971). Вядомы з 1529. У 1905 сяляне выступалі супраць царскай улады. У 1921—39 у складзе бурж. Польшчы. У Айч. вайну (чэрв. 1941—12.7.1944) акупаваны ням.-фаш. захопнікамі. У 1939—62 цэнтр Жалудоцкага р-на Баранавіцкай, а з 1944 Гро-



Жалудок. Вуліца Камуністычная.

дзенскай вобл. Хлебапякарня, кафельны з-д, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, дзіцячыя яслі-сад, мед. вучылішча, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца. Брацкая магіла 65 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі пры вызваленні Ж. Абеліск на брацкай магіле 2000 мірных грамадзян, якіх загубілі ням.-фаш. акупанты ў 1942. Помнік на магіле Героя Сав. Саюза П. М. *Батырава*. Радзіма польскага рэвалюцыянера В. *Урублеўскага*.

ЖАЛЬНІКІ, магілы 12—15 ст., невялікі насып якіх абкладзены камянямі. Мелі круглую ці прамавугольную форму. Трапляюцца пераважна ў Ноўгарадскай і Пскоўскай абл. Пахаванні адзіночныя і калектыўныя. Разам з нябожчыкам клалі ўпрыгожанні, гліняныя гаршкі і інш. рэчы. Ж. належалі славянам, у некат. выпадках — *водзі*. На Беларусі пахаванні, падобныя на Ж., называюцца *каменнымі магіламі*.

Літ.: Спицын А. А. Сопки и жальники, «Записки имп. Русского археологического об-ва. Новая сер.», т. 11, в. 1—2, СПб., 1899.

Г. В. Штыхаў. Мінск.

ЖАЛЯБАЎ Андрэй Іванавіч [17(29).8.1851, Феадасійскі пав. Таўрыйскай губ.— 3(15).4.1881], рускі рэвалюцыянер-народнік. З сям'і прыгонных сялян. За ўдзел у студэнцкіх хваляваннях (кастр. 1871) выключаны з ун-та (Адэса) і высланы. У 1873—78 вёў прапаганду сярод сялян Падольскай губ., сярод рабочых і інтэлігенцыі Адэсы, быў звязаны з дзеячамі ўкр. нац. руху. Судзіўся на «працэсе 193 прапагандыстаў» (1877—78). На з'ездах народнікаў у Ліпецку і Варонежы (1879) адстойваў тэрарыст. формы барацьбы супраць самадзяржаўя. Чл. Выканаўчага к-та «Народнай волі», адзін з стваральнікаў і кіраўнікоў яе рабочай, ваен. і студэнцкай арг-цый, «Рабочей газеты»; сааўтар найважнейшых праграмных дакументаў. Непасрэдна ўдзельнічаў у арг-цыі ўсіх гал. тэрарыст. актаў «Народнай волі». 27.2.1881 арыштаваны. Па яго патрабаванні далучаны да справы пра забойства Аляксандра II (1.3.1881). Трыбуну суда выкарыстаў для прапаганды рэвалюц. ідэй. Павешаны. У. І. Ленін высока ацаніў дзейнасць Ж.

Літ.: Ленін У. І. Што рабіць?, Тв., т. 5 (Поли. собр. соч., т. 6); Яго ж. Крах II Інтэрнацыянала, Тв., т. 21 (там жа, т. 26); Прокофьев В., А. Желябов, 2 изд., М., 1965 (Жизнь замечательных людей). *М. В. Біч.* Мінск.

ЖАЛЯЗНЯК Рыгор Самуілавіч (вер. 1914, Віцебск — 1942), беларускі савецкі пісьменнік і крытык. З рабочых. Вучыўся ў Ленінградскім ін-це гісторыі, філасофіі, л-ры і лінгвістыкі, скончыў Ленінградскі ун-т (1938). У 1931—32 працаваў у рэдакцыі газ. «Віцебскі пралетарый». Удзельнік Айч. вайны. Друкаваўся з 1931. Аўтар зборнікаў вершаў «Першы вытап» (з Б. Люгоўскім, 1933), «Вясновыя будні» (1934). Напісаў кандыдацкую дысертацыю «Паэзія М. А. Багдановіча». Загінуў пры абароне Ленінграда.



Тв.: У кн.—Мы іх не забудзем, Мн., 1949; Крывёю сэрца, Мн., 1967. *Р. А. Ларчанка.* Мінск.

ЖАМЕ́РЫНЫ, адходы цукровай вытворчасці, якія ідуць на корм жывёле (свежыя, сіласаваныя і сухія).

Буйн. раг. жывёле і авечкам Ж. скормліваюць у сумесі з грубымі кармамі, свіням і птушкам — з канцэнтраванымі, а слізною або травяною мукой. Сухія Ж. перад скармліваннем замочваюць.

ЖАМЫСЛАЎЛЬ, вёска ў Суботніцкім с/с Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Гаўя. Цэнтр саўгаса «Жамыслаўль».

За 25 *км* па Пн ад Іўя, 176 *км* ад Гродна, 16 *км* ад чыг. ст. Юрацішкі. 386 ж., гасп. 107 (1971). Спірт. з-д, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖАНГЛІРАВАННЕ (ад франц. jongler), жанр цыркавога мастацтва, заснаваны на ўменні падкідаць і лавіць адначасова некалькі прадметаў.

Адрозніваюць партэрнае Ж. (на цыркавым дыване з булавамі, кольцамі і інш. прадметамі); Ж. на конях, на дроце, манацыклах, драбінах; сілавое Ж.; Ж. т. зв. антыпадыстаў, якія жангліруюць нагамі. Мастацтва Ж. вядомае з стараж. часоў (у Ст. Егіпце, антычнай Грэцыі і Рыме). У сярэднія вякі з Ж. выступалі вандроўныя нар. акцёры (жанглёры ў Францыі, мімы ў Італіі, шпільманы ў Германіі, хугляры ў Іспаніі, франты ў Польшчы, скамарохі ў Расіі і на Беларусі). З 19 ст. Ж.— цыркавы жанр.

Літ.: Гл. пры арт. *Цырк*.


ЖАНДАРМЕ́РЫЯ (франц. gendarme паліцэйскі салдат), асобы від паліцыі ў феад. і бурж. дзяржавах. Упершыню створана ў 1791 ў Францыі, у Расіі ў 1815 (аб'яднана ў 1827 у асобы корпус жандараў). Вяла барацьбу супраць рэвалюц. руху, расследавала найб. важныя крымінальныя справы, кіравала злаўленнем беглых прыгонных, рэкрутаў, злачынцаў, рабіла даклады пра паліт. настрой розных слаёў насельніцтва. У кожнай губ., у т. л. і ў 5-ці беларускіх, існавалі губ. жандармскія ўпраўленні. У Расіі ліквідавана Лют. рэвалюцыяй 1917.

ЖАНЗАКАЎ Абдула (1918, пас. Акраб Акцюбінскага пав. Тургайскай вобл.— 30.6. 1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 22.6.1944 каля в. Сіроціна закідаў гранатамі варожы дзот. 24.6.1944 фарсіраваў Зах. Дзвіну, удзельнічаў у захопе плацдарма на левым беразе. Загінуў пры фарсіраванні Ушачы. Пахаваны ў в. Заскаркі Полацкага р-на.

«ЖАНІЦЬБА ЦЯРЭШКІ», старажытная беларуская народная гульня. Выбраныя «маці» і «бацька» дабіраюць хлопцаў і дзяўчат у пары («жэняць» іх); гульня спалучаецца з парнымі танцамі ў хуткім тэмпе (муз. памер $^3/_4$ або $^6/_8$), вясёлаю мітуснёй (дзяўчаты па чарзе ўцякаюць уздоўж выстраеных пар, а хлопцы даганяюць) і прыпяваннем. Пасля гульні наладжвалася агульная «вясельная» вячэра. «Ж. Ц.» належала да дашлюбных гульняў моладзі, прымеркаваных да калядных вечароў.

Літ.: Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 7, Вильно, 1910, с. 41—42. *Ю. М. Чурко.* Мінск.

ЖАННА Д'АРК (Jeanne d'Arc; каля 1412, в. Дамрэмі, Усх. Францыя — 30.5.1431), нар. гераіня Францыі. Узначаліла барацьбу супраць англічан у перыяд *Стогадовай вайны 1337—1453*. З сялян. У 1429 дамаглася аўдыенцыі ў дафіна Карла, пераканала яго пачаць актыўныя ваен. дзеянні супраць англічан і была пастаўлена на чале арміі, якая накіроўвалася да Арлеана. Франц. войскі атрымалі перамогу пад Арлеанам (за гэта ў



Уступленне Жанны д'Арк у вызвалены Арлеан (карціна мастака Шэрэра).

народзе яе празвалі Арлеанскай дзевай) і ў інш. бітвах. У вызваленым ад англ. войск Рэймсе дафін быў каранаваны як Карл VII. Поспехі франц. арміі выклікалі патрыят. ўздым нар. мас, прынеслі папулярнасць Ж. д'Арк. Кароль і прыдворная арыстакратыя, напалоханыя размахам нар. вайны, фактычна адхілілі Ж. д'Арк ад кіраўніцтва арміяй. У час адной ваен. аперацыі Ж. д'Арк захапілі ў палон бургундцы і выдалі сваім саюзнікам англічанам. Царк. суд абвінаваціў яе ў ерасі і вядзьмарстве. Спалена на кастры. Імя Ж. д'Арк стала для франц. народа сімвалам самаадданай любові да радзімы.

Літ.: Маркс К. Хронологические выписки, [сш.] 2, у кн.: Архив Маркса и Энгельса, т. 6 [М.], 1939, с. 327—329; Райцес В. И. Процесс Жанны д'Арк, М.— Л., 1964; Розенталь Н. Н. Жанна д'Арк — народная героиня, М., 1958; Левандовский А. Жанна д'Арк, М., 1962.

ЖАНО́ЧЫЯ АДДЗЕ́ЛЫ, аддзелы парт. камітэтаў па рабоце сярод жанчын з мэтай іх выхавання ў духу сацыялізма, далучэння да дзярж. і гасп. будаўніцтва.

Паводле ўказання ЦК РКП(б) у снеж. 1918 пры ўсіх ЦК нац. кампартый, краявых, абласных, гарысніх і павятовых парт. к-тах створаны камісіі па прапагандзе і агітацыі сярод жанчын. У снеж. 1919 рэарганізаваны ў Ж. а. Пры Гомельскім і Віцебскім губкомах РКП(б) створаны ў канцы 1919, пры ЦК КП(б) ЛіБ — у жн. 1920. У жн.— вер. 1929 Ж. а. ўзніклі пры павятовых к-тах партыі, існавалі да 1929. У 1946—53 Ж. а. дзейнічалі пры абкомах і райкомах КП(б)Б зах. абласцей Беларусі. З сав. і прафс. арг-цыямі Ж. а. склікалі дэлегацкія сходы, канфер. работніц, сялянак, заахвочвалі жанчын удзельнічаць у паліт., грамадскай і гасп. рабоце.

Літ.: Захватаева А. Жанчыны Беларусі — будаўнікі камунізма, Мн., 1962.
А. Н. Захватаева. Мінск.

ЖАНО́ЧЫЯ ВУЧЫЛІ́ШЧЫ І ГІМНА́ЗІІ, пачатковыя і сярэднія навуч. ўстановы для дзяўчынак у дарэвалюц. Расіі. Існавалі Ж. в. і г., якія падпарадкоўваліся Ведамству ўстаноў імператрыцы Марыі (Марыінскія), жан. вучылішчы Мін-ва нар. асветы і жан. вучылішчы пад наглядам Сінода (епархіяльныя).

Марыінскія жан. вуч. былі двух тыпаў: сярэднія жан. навуч. ўстановы, засн. ў 1858; жан. вуч. з 4-гадовым тэрмінам навучання для дзяўчынак з нізкіх слаёў насельніцтва. У канцы 80-х г. 19 ст. ў Расіі існавала 30 Марыінскіх вуч., на тэр. Беларусі — Мінскі і Віцебскі дзіцячыя прытулкі, Лепельскае 4-класнае вучылішча. У 1862 Марыінскія жан. вуч. 1-га тыпу перайменаваны ў гімназіі 7-класныя, платныя, пераважна для дзяцей дваран, буржуазіі і чыноўнікаў. У 1905 курс гімназій прыроўнены да курсу навучання ў ін-тах шляхетных дзяўчат, што мела на мэце не дапусціць жанчын у ВНУ. У 1911 у Расіі было 35 Марыінскіх жан. гімназій; на тэр. Беларусі — у Гродне, Віцебску і Мінску.

Жан. вучылішчы Мін-ва нар. асветы засн. ў 1858, падзяліліся на вуч. з 6-гадовым курсам навучання (першы разрад) і 3-гадовым курсам навучання (другі разрад). У 1868 у Расіі было 125 жан. вуч. Мін-ва нар. асветы. У 1844 засн. Мінская і Віцебская школы пач. навучання дзяўчынак з маёмных класаў. Да 1866 заснаваны жан. вуч. ў Брэсце, Пружанах, Слоніме, Мсціславе. Да 1876/77 навуч. г. адкрыты Нясвіжскае прыходскае жан. вуч.; Мінская, Гомельская, Бабруйская, Полацкая жан. школы; Ашмянскае, Жыровіцкае, Віцебскае, Мінскае, Парыцкае вуч. для дачок духавенства, а таксама 10 жан. нар. вучылішчаў і жан. змены пры 36 прыходскіх і 7 нар. вучылішчах. У канцы 70-х г. 19 ст. на Беларусі было 21 прыватнае жан. вуч. Існавалі прыватныя жан. пансіёны ў Віцебску, Полацку, Мінску, Магілёве, Рагачове, Слоніме. Навучанне ва ўсіх жан. вуч. і школах на Беларусі вялося на рус. мове; беларускіх навуч. жан. устаноў у губ. Паўн.-Зах. краю не было. У 1913 на Беларусі працавалі 33 яўр. жан. навуч. ўстановы, Гарадоцкае руска-латышскае жан. вуч. Рудабельскай воласці (з 1876). Пасля 1912 на Беларусі засн. Гарадоцкае і Брэсцкае вышэйшыя жан. пач. вучылішчы, 16 вышэйшых пач. вуч. супольнага навучання (Чачэрскае, Прапойскае, Жлобінскае і інш.).

У 1870 у гімназіі і прагімназіі перайменаваны вуч. Мін-ва нар. асветы. Паводле Палажэння аб гімназіях і прагімназіях у Паўн.-Зах. краі (1869) на Беларусі да 1913 адкрыліся жан. дзярж. гімназіі: Гомельская (1882), Мінская (1889), з 1903 да 1912 — Бабруйская, Брэсцкая, Віцебская, Ваўкавыская, Пінская, Клімавіцкая, Мазырская, Полацкая, Слонімская, Слуцкая і інш. Навучанне платнае. Выпускніцам з 1881 прысвойвалася званне настаўніцы пач. школ. Прыватныя жан. гімназіі пачалі адкрывацца з 1872. На Беларусі да 1913 было 14 прыватных жан. гімназій і 2 дзярж. прагімназіі.

Епархіяльныя вучылішчы — сярэднія жан. навуч. ўстановы для дачок праваслаўнага духавенства, засн. паводле статута 1843. Выпускніцы набывалі права хатніх настаўніц і настаўніц пач. класаў (пераважна ў сельскіх школах). На Беларусі заснаваны: Спаса-Ефрасіннеўскае каля Полацка (1844), у Парычах (1860), Мінску і Магілёве (1863), Віцебску (1864).

Перадавыя настаўнікі і прагрэс. дзеячы Беларусі змагаліся за развіццё жан. адукацыі, дабіваліся пашырэння адукацыі для дзяўчынак у пар. і прыходскіх пач. школах, адкрыцця пач. школ супольнага навучання. Асветніцкая дзейнасць народнікаў 70-х г. на Беларусі таксама садзейнічала пашырэнню жан. адукацыі. У Магілёўскай і Гродзенскай губ. па пар. ініцыятыве ў пач. 20 ст. засн. пяць 4-класных жан. навуч. устаноў 2-га разраду, у якіх навучалася 486 чал. Гл. таксама *Інстытуты шляхетных дзяўчат, Гімназія.*

Літ.: Лихачева Е. О. Материалы для истории женского образования в России (1886—1856), СПб., 1899; я е ж. Материалы для истории женского образования в России. 1856—1880, СПб., 1901; Малиновский Н. П. Очерки по истории женского среднего образования в России, «Русская школа», 1914, № 9—10; Корнилов И. Русское дело в Северо-Западном крае, СПб., 1901; Константинов Н. А. Очерки по истории средней школы, 2 изд., М., 1956; Памятная книжка Виленского учебного округа на [1874—1915], Вильна, 1874—1915. *Г. Р. Сяньжевіч.* Мінск.

ЖАНО́ЧЫЯ ХВАРО́БЫ, спецыфічныя хваробы жанчын, звязаныя з асаблівасцямі іх арганізма. Аснова сучаснага вучэння пра Ж. х.— вучэнне пра жаночую палавую фізіялогію і паталогію з улікам сацыяльна-бытавых умоў.

У розныя перыяды жыцця ў жанчыны бываюць пэўныя Ж. х. Заганы развіцця палавых органаў (двухрогая і двайная маткі, двайная похва, агульнае недаразвіццё палавых органаў — інфантылізм, вузкі таз і інш.) уласцівыя жаночаму арганізму да надыходу палавай спеласці. Прычыны: прыродныя заганы ці вынік ускладненняў пасля інфекцыйных хвароб (шкарлятыны, дыфтэрыі і інш.). Запаленні жаночых палавых органаў уласцівыя жанчынам у перыяд палавай спеласці. Бываюць ад ганарэі, абортаў, паслярадавых ускладненняў, радзей ад сіфілісу, туберкулёзу, трыхаманозу і інш. У гэты перыяд могуць развівацца дабраякасныя і злаякасныя пухліны (фібраміёмы маткі, кісты яечнікаў, рак шыйкі і цела маткі; гл. *Пухліны*). Паразітычныя і грыбковыя Ж. х. выклікаюцца грыбкамі (напр., малочніца) і гельмінтамі. Ж. х. бываюць, калі парушана размяшчанне полавых органаў — пры зрушэнні маткі і сценак похвы або іх выпадзенні. Самастойная група Ж. х.— парушэнні *менструацыі*. Пасля клімактэрыю (гл. *Клімакс*) запаленні жаночых полавых органаў бываюць радзей, але могуць развіцца пухліны (рак маткі, яечнікаў і інш.). Прыкметы Ж. х.: белі, крывацёкі, болі. Лячэнне: медыкаментознае, пры неабходнасці — хірургічнае. Прафілактыка: агляд усіх жанчын 2 разы на год, ахова жаночай працы, полавае выхаванне, сістэмат. заняткі фізкультурай, спортам, полавая гігіена.

Літ.: Кватер Е. И. Гормональная диагностика и терапия в акушерстве и гинекологии, 3 изд., М., 1967 (бібліягр.); Персианинов Л. С. Внутриартериальное переливание крови в акушерско-гинекологической практике, Мн., 1955; Каськo П. И. Женские болезни, Мн., 1966; Дозорцева Г. Л. Функциональная диагностика в акушерстве и гинекологии на основе цитологических исследований, Мн., 1952. *Л. М. Гаршанава.* Мінск.

ЖАНО́ЧЫЯ ЧАСО́ПІСЫ, грамадска-палітычныя і літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні для жанчын.

Першы Ж. ч. у Расіі «Модное ежемесячное издание, или Библиотека для дамского туалета» (1779) выдаваўся М. І. Навіковым, друкаваў маст. творы і малюнкі мод. У 19 ст. выходзілі Ж. ч., якія змяшчалі сентыментальныя творы для лёгкага чытання, парады па дамаводстве, рукадзеллі, модах, выхаванні дзяцей, свецкую і тэатр. хроніку і інш.: «Журнал для милых на 1804» (1804), «Кабинет Аспазии» (1815), «Дамский журнал» (1823—33), «Московский альманах для прекрасного пола» (1826—29, назва мянялася). «Женский вестник» (1866—68) і інш. У канцы 19 — пач. 20 ст. ствараюцца Ж. ч., якія ставяць сваёй мэтай змагацца за жаночае раўнапраўе, абараняць правы жанчын на адукацыю і іх удзел у грамадскім жыцці: «Женское образование» (1872—1909, назва мянялася). «На помощь матерям» (1894—1901, 1904), «Женский вестник» (1904—17) і інш.

У 1914 па ініцыятыве У. І. Леніна заснаваны легальны бальшавіцкі час. «Работница», орган ЦК РСДРП(б), які актыўна намагаў партыі арганізоўваць жанчын на барацьбу з самадзяржаўем. Выйшла 7 нумароў, 2 з іх канфіскаваны; у 1914 забаронены. Пры ўдзеле Н. К. Крупскай у ліп. 1917 выйшаў нумар

час. «Жизнь работницы». У СССР выходзяць Ж. ч.: «Работница» (выданне аднаўлена ў 1917, перапынак 1919—22, з 1923 выходзіць аноў), «Крестьянка» (з 1922), «Советская женщина» (з 1945, выдаецца на рус., англ., франц., ісп., ням. і інш. мовах), «Женщины мира» (з 1958 выданне МДФЖ, прадаўжае год выдання час. «Женщины мира», які выходзіў з 1947 на ням. мове; выдаецца на рус., ісп., англ., ням. мовах). Ж. ч. выходзяць ва ўсіх саюзных і аўт. рэспубліках. У БССР — *«Работніца і сялянка»* (з 1924).

У сацыяліст. краінах выдаюцца Ж. ч.: Балгарыя — «Жената днес» («Жанчына сёння», з 1946); Венгрыя — «Nök lapja» («Жаночы часопіс», з 1948); ДРВ — «Phu nu Viet-Nam» («В'етнамская жанчына»); Польшча — «Przyjaciółka» («Сяброўка», з 1948); Румынія — «Femeia» («Жанчына», з 1948); Чэхаславакія — «Чехословацкая женщина», з 1955, на чэш., рус., англ., венг., ісп., кіт., карэйскай, ням., франц., хіндзі і яп. мовах і інш.

Л. Дз. Васілеўская, Л. І. Збралевіч. Мінск.

ЖАНР (франц. genre род, від), тып мастацкай формы, адносна ўстойлівы комплекс структурных асаблівасцей маст. твора, у якім абагульняюцца рысы (кампаненты формы), уласцівыя цэлай групе твораў якой-небудзь эпохі, нацыі ці ўсяго сусв. мастацтва.

Узнікненне новых Ж. тлумачыцца патрэбай грамадства ў эстэт. асваенні новых з'яў і працэсаў рэчаіснасці. Жанры эвалюцыянуюць, паступова мяняюцца, але астаюцца асн. прыметы, замацаваныя ў свядомасці мастака і публікі. Маст. творы аб'ядноўваюцца ў Ж. на аснове розных, узаемазвязаных прыцыпаў: паводле прызначэння (песня, танец, марш — у музыцы), паводле тыпу кампазіцыі (лірычныя вершы ў форме рандо, санета і г. д.), прадметна-тэматычнай блізкасці (Ж. жывапісу — партрэт, пейзаж, нацюрморт, гістарычны Ж., батальны, бытавы і інш.). З развіццём Ж. паяўляюцца жанравыя разнавіднасці. Напр., разнавіднасць рамана — бытавы, псіхал., гістар., філас., прыгодніцкі і г. д.; пейзажнага Ж.— арх. пейзаж, марына. Страта жанрам устойлівых прыкмет вядзе да зліцця гэтага Ж. з іншым або да яго адмірання (напр., адміранне ў т-ры містэрыі, мараліте, міракля і інш.).

ЖАНРЫ ГАЗЭТНЫЯ, літаратурныя формы адлюстравання рэчаіснасці ў перыядычным друку. У залежнасці ад прызначэння, вываду і абагульненняў, характару літаратурна-стылістычных сродкаў падзяляюцца на інфармацыйныя, аналітычныя і мастацка-публіцыстычныя.

Інфармацыйныя Ж. г. [заметка (нататка), справаздача, інтэрв'ю, *рэпартаж*] выконваюць пераважна функцыю паведамлення. Заметка фіксуе, што, дзе, калі адбылося ці мае адбыцца, дакладна і сцісла паведамляе пра новыя факты і падзеі. Справаздача перадае яшчэ і падрабязнасці падзеі. Інтэрв'ю — літ. пераказ гутаркі з дзярж., грамадскім і інш. дзеячамі, чые думкі і тлумачэнні па пэўных пытаннях маюць грамадскую цікавасць. У рэпартажы факты падаюцца праз непасрэднае ўспрыманне аўтара. Аналітычным Ж. г. (карэспандэнцыя, артыкул, агляд, рэцэнзія) характэрна распрацоўка тэмы шляхам аналізу фактаў і з'яў. У карэспандэнцыі вырашаецца актуальная, але параўнальна нешырокая тэма, і вывады звычайна не выходзяць за межы аб'екта даследавання. Артыкул (прапагандысцкі, праблемны і інш.) вызначаецца шырынёй тэарэт. і практ. абагульненняў, глыбінёй аналізу канкрэтных фактаў. У перадавых артыкулах газет і часопісаў выказваецца пазіцыя рэдакцыі па важных пытаннях. У літ. і маст. агляды, рэцэнзіях і аглядах друку даследуецца творчасць пісьменнікаў, мастакоў, журналістаў, разглядаюцца пытанні майстэрства. Мастацка-публіцыстычным Ж. г. *(нарыс, фельетон)* характэрна вобразнае адлюстраванне рэчаіснасці. Нарыс і фельетон у газеце маюць усе прыметы літ. твораў, але грунтуюцца на дакументальнай аснове. Практыка газетнай работы дае прыклады ўзаемапранікнення жанраў, адзінства інфармацыі і аналізу, інфармацыі і публіцыстычнага асэнсавання рэчаіснасці. Гл. таксама *Жанр.*

Літ.: Жанры советской газеты, М., 1959; Проблемы газетных жанров, Л., 1962; Газетные жанры, М., 1971.

В. В. Стральцоў. Мінск.

ЖАРАБКОВІЧЫ, вёска ў Ляхавіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр Падлескага с/с і калгаса «Беларусь». За 13 *км* на У ад Ляхавіч, 229 *км* ад Брэста, 10 *км* ад чыг. ст. Шчэпічы, на шашы Ляхавічы — Клецк. 668 ж., двароў 205 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа. Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, зубаўрачэбны кабінет, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік 14 жыхарам вёскі, помнік на брацкай магіле 6 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ЖАРАЎ Міхаіл Іванавіч [н. 14(27).10.1900, Масква], рускі савецкі акцёр тэатра і кіно. Нар. арт. СССР (1949). Чл. КПСС з 1950. З 1938 у Малым т-ры. Мастацтва Ж. вызначаецца народнасцю, мяккасцю, сакавітым гумарам. З роляў: Аляксей («Антымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага ў Камерным т-ры), Харытонаў («За тых, хто ў моры!» Б. Лаўрэнёва), Мітрыч («Улада цемры» Л. Талстога), Лебедзеў («Іванаў» А. Чэхава). З 1924 здымаецца ў кіно: «Пуцёўка ў жыццё», «Пётр Першы», «Абарона Царыцына», «Вясковы дэтэктыў» і інш., бел. фільмы «Мядзведзь» (1938), «Чалавек у футарале» (1939), «Чырвоная ліса» (1958). Дзярж. прэміі СССР 1941, 1942, 1947. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна.

Тв.: Жизнь, театр, кино. Воспоминания, М., 1967.

ЖАРГОН, гл. ў арт. *Арго.*

ЖАРДЗЯНКА, рака, правы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 25 *км.* Цячэ ў Светлагорскім р-не Гомельскай вобл. Рэчышча каналізаванае. Паверхня водазбору (334 *км*²) плоска-хвалістая. Прылеглая да ракі мясцовасць забалочана і залесена. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 1,37 *м*³/*сек.* Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.

ЖАРКОЎ Ігар Васілевіч [н. 10(23).6.1910, с. Месягутава Уфімскага пав.], савецкі заолаг. Д-р біял. н. (1969). Скончыў Казанскі ун-т (1934). Працаваў у Каўказскім, Куйбышаўскім, Варонежскім запаведніках (1936—69). Заг. кафедры заалогіі Гомельскага ун-та (з 1969). Навук. працы па прамыслова-паляўнічых угоддзях, пытаннях жыўлення, метадах уліку прамысл. і ахоўных жывёл, метадыцы феналагічных назіранняў, біялогіі і рэакліматызацыі рачнога бабра ў СССР.

Тв.: Простейшие наблюдения в природе, 2 изд., М., 1956; Итоги расселения речных бобров в СССР, М., 1966.

ЖАРКОЎСКІ Даніла Уладзіміравіч [н. 20.12.1903(2.1.1904), в. Ходараўка Горацкага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі хімік. Д-р хім. н. (1966), праф. (1967). Чл. КПСС з 1929. З сялян. Парабкаваў. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў у 1926 рабфак Горацкай с.-г. акадэміі, у 1931 Беларускі лесатэхнічны ін-т (Гомель), у 1935 Ленінградскую лесатэхн. акадэмію. У 1936—41 і ў 1946—52 працаваў у Ін-це хіміі АН БССР. З 1952 у Бел. ін-це нар. гасп., потым у Бел. ін-це механізацыі с. гасп. З 1968 у Ін-це фізіка-арган. хіміі АН БССР. Асн. навук. працы па вывучэнні цэлюлозы і яе эфіраў як матэрыялаў для атрымання штучных валокнаў, плёнак, папяры і інш. Даследаваў утварэнне алкагаляту цэлюлозы ў працэсе мерсерызацыі, прапанаваў каларыметрычны метад вызначэння аморфнай часткі цэлюлозы, даказаў дыфільны характар яе ўласцівасцей.

Тв.: Физико-химические исследования целлюлозы и ее эфиров (К вопросу о структуре целлюлозы), Мн., 1960; (з І. Г. Георгіевым) Топливо, смазочные материалы и вода, Мн., 1963.

ЖАРЛЯНКІ, укі (Bombina), род бясхвостых земнаводных сям. круглазычных. Вядома 4 віды Ж. (чырванабрухая, жаўтабрухая, далёкаўсходняя, гіганцкая), пашыраных у Еўропе і Усх. Азіі. У СССР 3 віды (няма гіганцкай), на Беларусі — чырванабрухая Ж. (Bombina bombina).

Даўж. цела Ж. да 6,8 см. Характэрныя прыкметы: адсутнасць барабаннай перапонкі, трохгранная зрэнка, бугарчатая скура, чырвоныя або жоўтае брушка з рознымі чорнымі плямамі. Даўж. цела чырванабрухай Ж. да 5 см, спіна цёмна-аліўкавая, радзей чорная, брушка чырвонае або аранжавае з чорна-сінімі плямамі. Скура выдзяляе едкі сакрэт. Жыве чырванабрухая Ж. у сажалках, канавах, азёрах, на балотах. Зімуе на сушы. Карысная, знішчае дробных жукоў, двухкрылых, лічынак насякомых, малюскаў. Ілюстрацыю гл. на ўклейцы да арт. *Земноводные.*

Літ.: Жизнь животных, т. 4, ч. 2, М., 1969.

ЖАРНАСЕК Ілья Максімавіч (н. 2.8.1918, в. Падымхі Лепельскага пав. Віцебскай губ.), генерал-маёр (1966), д-р ваен. н. (1967), праф. (1968). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў Ваен. акадэмію тылу і забеспячэння (1947). У Чырв. Арміі з 1938. Удзельнік сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну нач. фін. забеспячэння шпіталя і штаба арміі. З 1953 навук. супрацоўнік, нач. аддзела ў Міністэрстве абароны СССР; з 1965 нач. кафедры Ваен. акадэміі тылу і транспарту. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Жарновец мяцёлчаты.

ЖАРНОВЕЦ (Sarothamnus), род кустовых раслін сям. матыльковых. Вядомы 1 від — Ж. мяцёлчаты (S. scoparius).

Куст выш. да 1,5 *м*, з рабрыста-граністымі прутканадобнымі галінкамі. Лісце трайчастае, прадаўгаватае або адваротна-яйцападобнае, уверсе рэдукаванае. Кветкі залацістажоўтыя, размешчаныя па адной у пазусе ліста. Плады прадаўгаватыя, па швах калматыя струкі. На ПдЗ Беларусі расце ў хваёвых лясах і хмызняках. Можа выкарыстоўвацца для паляпшэння глебы, як зімовы корм авечкам і як дэкар. расліна. Добры меданос. Валакно кары — эрзац джуту.

Літ.: Флора БССР, т. 3, Мн., 1950.

ЖАРОМСКІ (Zeromski) Стэфан (14.10.1864, маёнтак Страўчын Келецкай губ.— 20.11.1925), польскі пісьменнік. Са збяднелай шляхты. Вучыўся ў Вышэйшай вет. школе ў Варшаве. Тэматыка першых аб. апавяданняў «Раздаўбе нас варанiё» (1895), «Апавяданні» (1895), рамана «Сізіфава праца» (1897), «Бяздонныя» (1900), «Попел» (1904) — нац.-вызв. барацьба, грамадскія канфлікты, невыноснае жыццё сац. нізоў. Вітаў рэв. 1905—07 у Расіі (публіцыст. арт. «Голы брук», 1906; «Слова пра парабка», 1908; драма «Ружа», 1909). Пасля паражэння рэвалюцыі ў творчасці Ж. мацнеюць песімістычныя настроі. У гістар. рамане «Дума пра гетмана» (1908) выказаў ідэю неабходнасці нагаднення паміж Польшчай і Расіяй. Раман «Верная рака» (1912) — пра паўстанне 1863. Несправядлівасць капіталіст. ладу асудзіў у рамане «Гісторыя граху» (1908) і ў трылогіі «Барацьба з шайтанам» (1916—19). Пакуты працоўных, маральнае спусташэнне пануючых класаў праўдзіва паказаў у рамане «Прадвесне» (1925).

Тв.: Utwory wybrane, t. 1—5, Warszawa, 1964; бел. пер.— Пасля Сэдану [Апавяд.], «Наша ніва», 1908, № 8, 11(24) сак.; у кн.: Жэромскі С. Што б ні адарылася — вытрываю.— Віткевіч С. Расказ Сабалы.— З. Воўк, Мн., 1914; рус. пер.— Избр. соч., т. 1—4, М., 1957—58; История греха, М., 1961.

Літ.: Витт В. В. Стефан Жеромский, М., 1961.

У. М. Казбярук. Мінск.

ЖАРСТВА, рыхлы матэрыял, складзены з вугласватых абломкаў, утвораных пры выветрыванні пераважна магматычных парод. Гл. *Абломкавыя горныя пароды.*

ЖАРТ, 1) від народнай анавідальнай творчасці, у аснове якога — смешнае здарэнне, дасціпная насмешка.

У параўнанні з анекдотам, які выстаўляе на смех і сацыяльна-паліт. з'явы, Ж. звычайна незласлівы высмейвае бытавыя здарэнні, паасобныя рысы і якасці людзей. Як і анекдоту, Ж. характэрныя адназдымасць, нечаканасць выніку. Найб. папулярная форма Ж.— дыялог (напр.: «Прынесла цётка ігруш валасному старшыні, а ён ёй гаворыць: — І навошта прынесла? Свае б дзеткі паласаваліся.— Ешце, пане начальнік, а дзеткам скажу, што свінка а'ела»). Бытуе шмат жартаў-прыказак, жартаў-загадак і інш.

2) Жанр драм. творчасці, кароценькая аднаактоўка п'еса камічнага зместу, найчасцей прыватна-бытавога характару (напр., «Збянтэжаны Саўка» Л. Родзевіча).

Літ.: Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 2, СПб, 1893; Беларускія жарты, Мн., 1915; Народныя ўсмешкі, Мн., 1961; Вясналы З. (скл.). Беларускія народныя жарты, Мн., 1970; Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны, Мн., 1961.

А. С. Фядосік. Мінск.

ЖАРТАПКА, рака, левы прыток Бярэзіны (бас. Дняпра). Даўж. 20 *км.* Цячэ ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Вадазбор (86 *км*²) у межах Бярэзінскага запаведніка. Паверхня — плоская забалочаная раўніна, складзеная з пясчана-гліністых водналеднікавых адкладаў. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,58 *м*³/*сек.*

ЖАРУШНІК (Rorippa), род адна- і шматгадовых прыбярэжна-водных раслін сям. крыжакветных. Вядома каля 50 відаў, пашыраных у паўн. паўшар'і. У СССР 11, на Беларусі 6 відаў. Найб. пашыраныя — Ж. балотны (R. islandia), Ж. земнаводны, вадзяны хрэн (R. amphibia), Ж. лясны (R. silvestris).

Раслінам уласцівая разналіснасць (гетэрафілія): падводнае лісце пітнападобнае, надводнае



Жарушнік балотны: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — стручок.


рассечана на ланцэтныя шырокія долі, самае верхняе — цэласнае. Кветкі жоўтыя, з прадаўгаватымі пялёсткамі. Плод — стручок або стручочак. Расце Ж. па багністых берагах вадаёмаў, на вільготных лугах.

Літ.: Флора БССР, т. 2, Мн., 1949.

ЖАРЫ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Жары». За 40 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 143 *км* ад Мінска, 15 *км* ад чыг. ст. Крывічы, на шашы Вілейка — Докшыцы. 264 ж., гасп. 87 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 22 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЖАРЫ, вёска ў Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны прамень». За 14 *км* на Пд ад Ушачаў, 140 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Лепель. 257 ж., гасп. 86 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. 10.10.1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі 30 дамоў, расстралялі 58 мірных жыхароў вёскі (паводле ўдакладненых звестак). Помнік на брацкай магіле 48 партызанаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЖАРЭС (Jaurés) Жан (3.9.1859, г. Кастр — 31.7.1914), дзеяч французскага і міжнар. сацыялістычнага руху, змагар супраць мілітарызму і вайны, гісторык. Праф. філасофіі (1883). У 1885—89, 1893—98 і 1902—14 дэпутат парламента. У 1893 далучыўся да яго сацыяліст. фракцыі, аднак не стаў сапраўдным пралет. рэвалюцыянерам, не пазбавіўся памылковых уяўленняў і дробнабурж. ілюзій. У рабочым руху і ў 2-м Інтэрнацыяналe трымаўся пераважна рэфармісцкіх ці блізкіх да іх пазіцый. У 1902 узначаліў правую Франц. сацыяліст. партыю, а пасля яе аб'яднання з Сацыяліст. партыяй стаў адным з лідэраў правага крыла Аб'яднанай сацыяліст. партыі. Нягледзячы на памылкі ў тэарэт. і практ. дзейнасці, быў мужны, бездакорна сумленны абаронца дэмакратыі і міру. У 1904 заснаваў газ. «L'Humanité» («Чалавецтва»), якая з 1920 стала цэнтр. органам Франц. кампартыі. Разумеў міжнар. значэнне рус. рэвалюцыі 1905—07, выступаў на яе абарону. Нягледзячы на ўсе свае памылкі, Ж. — адзін з самых выдатных дзеячаў франц. і міжнар. сацыялістычнага руху.



Жарэс

Тв.: Рус. пер.— Избр. речи и статьи, СПб., 1907; История великой французской революции, т. 1—4, М.— П., 1920—24; Против войны и колониальной политики, М., 1961.

Літ.: Ленін У. І. Тв. (гл. Даведачны т., ч. 1, с. 156—157); Торез М. Избр. произв., т. 1—2, [пер. з франц.], М., 1959 (гл. Паказальнік імён); Дюкло Ж. Избр. произв., т. 1—2, [пер. з франц.], М., 1959 (гл. Паказальнік імён); Манфред А. З. Ж. Жорес — борец против реакции и войны, у яго кн.: Очерки истории Франции XVIII—XX вв., М., 1961.

ЖАСКЕН ДЭПРЭ, Жаскін дэ Прэ (Josquin Després, Josquin des Prés; каля 1450—27.8.1521), франка-фламандскі кампазітар. Працаваў у Італіі (у 1486—94 у папскай капэле ў Рыме), Паўн. Францыі. Выдатны паліфаніст, прадстаўнік *Нідэрландскай школы*; яго творы (больш за 30 мес, матэты, шансон) прасякнуты гуманіст. светаадчуваннем, звязаны з нар. вытокамі. Зрабіў вялікі ўплыў на развіццё еўрап. музыкі эпохі Адраджэння.

ЖАСТКОЎ Аляксандр Пятровіч (26.7.1922, в. Слаўцава Меленкаўскага пав. Уладзімірскай губ.— 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 23.6.1944 узвод на чале са ст. лейтэнантам Ж. фарсіраваў Лучосу і захапіў плацдарм каля в. Карпавічы, забяспечыўшы пераправу астатніх падраздзяленняў.. 25.6.1944 адбіў 4 контратакі каля в. Камары. Загінуў у баі. У в. Ваяводкі Віцебскага р-на Ж. пастаўлены помнік-абеліск.

ЖАСЦЁР (Rhamnus), род кустоў і дрэў сям. крушынавых. Вядома больш за 150 відаў. На Беларусі адзін дзікарослы — Ж. слабільны (Rh. cathartica) і каля 10 відаў інтрадукаваных або адзічэлых.

Лісце цэласнае. Кветкі жаўтавата-зялёныя, сабраныя ў пазушныя пучкі або ў кутасападобныя суквецці. Плод — ягадападобная касцянка. Ж. слабільны — галінасты, калючы куст ці дрэўца выш. 1,5—3 *м*. Расце Ж. на сухіх месцах, на схілах яроў, па высокіх берагах рэк, на ўзлесках. Добры меданос. Спелыя плады і кара ўжываюцца ў медыцыне (ірвотны і слабільны сродак). Плады багатыя на фарбавальныя рэчывы (з іх гатуюць акварэльныя фарбы). Драўніна прыгонная, цвёрдая, ідзе на дробныя сталярныя вырабы. Ж. выкарыстоўваецца для азеляненння, на жывых агароджах.



Жасцёр слабільны.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэндралогія*.

ЖАСЦІНІЛЕ, вёска ў Акалоўскім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Арджанікідзе. За 39 *км* на Пн ад Лагойска, 79 *км* ад Мінска, 68 *км* ад чыг. ст. Барысаў, каля шашы Плешчаніцы — Вягомль (2 *км*). 313 ж., двароў 94 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, сталовая, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖАЎРУК Алесь (сапр. Сініцкін Аляксандр Дзмітрыевіч; 19.8.1910, г. Сянно — 23.8.1942), беларускі савецкі паэт. З сям'і службоўца. Пасля заканчэння Маск. ін-та гісторыі, філасофіі і л-ры (1938) займаўся ў аспірантуры пры АН БССР. У 1939 прызваны ў Чырв. Армію, працаваў ваен. карэспандэнтам. Загінуў пад Сталінградам. Друкавацца пачаў у 1926. Зб. вершаў «Ручаіны» (1936) і «Дняпро выходзіць з берагоў» (1938) прасякнуты пафасам маладосці, радасці жыцця, рамант. узнёсласцю. Найлепшы твор — паэма «Крывёю сэрца» (апубл. 1938) — пра грамадз. вайну ў Іспаніі. Пісаў для дзяцей (паэмы «Пра майго таварыша», «Пра слаўных папанінцаў» пашага дзетсада», 1939, з А. Ушаковым). Сааўтар лібрэта аперэты «Зарэчны бор» (з Ушаковым).



Жаўрук Алесь

Тв.: Выбранае, Мн., 1960; (з А. Ушаковым) Пра майго катка, Мн., 1950. *В. Л. Бечык.* Мінск.

ЖАЎТАКРУГ (Achyrophorus), род шматгадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Вядома 20 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Паўд. Амерыцы. У СССР 3 віды, на Беларусі адзін — Ж. рабы (A. maculatus).

Сцябло шурпата-валасістае, выш. да 1 *м*. Лісце прадаўгавата-авальнае, у прыкаранёвай разетцы. Кветкі жоўтыя, сабраныя ў валікія кошыкі. Ж. рабы расце на лясных лугах, травяністых схілах, у хмызняках.



Жаўтакруг рабы: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — сямянка з чубком.

ЖАЎТАЛОЗ, вярба пурпуровая (Salix purpurea), куст сям. вярбовых. Пашыраны ў Еўропе, Паўд. Азіі і Паўн. Афрыцы. На Беларусі расце на берагах рэк, азёраў, каналаў, на забалочаных лугах.

Выш. 1—2, радзей 4 *м*. Галінкі тонкія, гнуткія, жаўтаватыя ці карычневыя з шызаватым налётам. Лісце зеленавата-шызае, адваротна-ланцэтнае, вострае, раканцовае, па краі пілаватае. Выкарыстоўваецца для замацавання берагоў, адхонаў, стварэння ахоўных пасадак і жывых агароджаў. Прут ідзе на тонкае пляценне. Кара Ж.— добры дубільнік, ідзе таксама на выраб саліцыну. Ж. вырошчваецца як дэкар. расліна. Добры медонос.

Літ.: Гл. пры арт. *Вярба*.

ЖАЎТУХА, жоўтая афарбоўка скуры, слізістых абалонак, вочных склераў, якая бывае пры хваробах печані (гл. *Боткіна хвароба*), жоўцевых шляхоў (*жоўцекамянёвая хвароба* і інш. механічныя Ж.), крыві (*гемалітычная хвароба нованароджаных* і інш. гемалітычныя Ж.), пры некат. фізіял. станах (*жаўтуха нованароджаных*), ад павышанага назапашвання ў крыві і ў тканках жоўцевага пігменту — білірубіну.

Літ.: Бондарь З. А. Желтухи, М., 1965 (бібліягр.).

ЖАЎТУХА НОВАНАРОДЖАНЫХ, жаўтушная афарбоўка скуры і слізістых абалонак у дзяцей да 4—5 тыдняў жыцця. Бывае ад парушэння звязвання *білірубіну* (фізіялагічная Ж. н.), ад узмоцненага распаду — гемолізу эрытрацытаў *(гемалітычная хвароба нованароджаных)*, ад мех. затрымкі жоўці (прыроджанае недаразвіццё або набытае звужэнне жоўцевывадных шляхоў), ад пашкоджання тканак печані. Лячэнне накіравана на выдаленне білірубіну з арганізма, фізіялагічная Ж. н. лячэння не патрабуе.

Літ.: Бондарь З. А. Желтухи, М., 1965 (бібліягр.); Гульке вич Ю. В. и Штыцко Э. Е. Желтухи новорожденных, «Архив патологии», 1960, т. 22, № 1; гл. таксама літ. пры арт. *Гемалітычная хвароба нованароджаных*.

ЖАЎТУХІ РАСЛІН, група хвароб, якія выклікаюцца фільтроўнымі вірусамі.

Прыкметы: пажоўкласць, скручванне і кучаравасць лісця, выродлівасць кветак, парушэнне росту (карлікавасць, правмерная кусцістасць і разгалінение), дэфармацыя пашкоджаных органаў, гіпертрафія лубу і інш. Пераносяцца цыкадкамі, кляшчамі, тлёю. На Беларусі вафіксаваны Ж. р.: скручванне лісця бульбы, суніц, памідораў, жоўтая карлікавасць бульбы, стаўбур памідораў, махрыстасць парочак, жаўтуха буракоў. Меры барацьбы: правільная агратэхніка, знішчэнне насякомых-пераносчыкаў і пустазелля, вырошчванне ўстойлівых да вірусаў сартоў.

Літ.: Пересыпкин В. Ф. Сельскохозяйственная фитопатология, М., 1969.

ЖАЎТУШНІК (Erysimum), род адна-, двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. крыжакветных. Вядома каля 100 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і. У СССР 51 від, на Беларусі 3, з іх найб. пашыраны Ж. ляўконіевы (E. cheiranthoides, нар. назвы: гарчычка, жаўтушка).

Сцябло выш. да 1 *м*. Лісце цэласнае, апушанае. Кветкі жоўтыя, радзей ліловыя ці белыя, у гронках. Плод — стручок. Ж. ляўконіевы расце на сухіх лугах, узлесках, на палях як пустазелле, каля дарог і жылля. Добры медонос. Каштоўная лекавая расліна (мае сардэчныя гліказіды групы кардэналідаў). У медыцыне выкарыстоўваецца і Ж. шэры (E. canescens).



Жаўтушнік ляўконіевы.

Літ.: Желтушник серый, М., 1953.

ЖАЎЦЯГОННЫЯ СРОДКІ, лякарствы, якія павялічваюць утварэнне жоўці або выдзяленне яе ў кішэчнік.

Падзяляюцца на 3 групы: прэпараты, у якіх ёсць жоўць і жоўцевыя к-ты (дэгідрахолевая к-та,

дэхалін, алахол, халензім); сінт. рэчывы (цыкваліон, оксафенамід, нікадзін, берберыну сульфат); лекавыя пастоі, экстракты, канцэнтраты, якія атрымліваюць з кветак бяссмертніка пясчанага, рыльцаў кукурузы, кветак пясчанага кмену, вялікага падтыпніку, амурскага барбарысу і інш. Ж. с. ўжываюць пры хваробах печані і жоўцевывадных шляхоў *(гепатыт, халецыстыт,* халангіт, *жоўцекамянёвая хвароба).*

Літ.: Машковский М. Д. Лекарственные средства, ч. 1, 6 изд., М., 1967; Лекарственные растения. Дикорастущие, 4 изд., Мн., 1968.

ЖАХАВІЧЫ, вёска ў Скрыгалаўскім с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл., прыстань на правым беразе Прыпяці. Цэнтр калгаса «Савет». За 47 *км* на ПнЗ ад Мазыра, 180 *км* ад Гомеля, 42 *км* ад чыг. ст. Козенкі. 553 ж., двароў 190 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 30.7.1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 23 мірных жыхароў. З брацкія магілы 16 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖВА́ЧНЫЯ (Ruminantia), падатрад млекакормячых атр. парнакапытных. Вядома каля 80 відаў, аб'яднаных у 5 сям.— аленевых, аляпьковых, жырафавых, пустарогіх і віларогіх. Пашыраны ўсюды (акрамя Аўстраліі, Мадагаскара і Антыльскіх а-воў). У СССР сям. аленевых і пустарогіх. На Беларусі — *зубр, высакародны алень, казуля, лось, лань.* Да Ж. належыць свойская жывёла: авечкі, козы, буйн. раг. жывёла, паўн. алені, ламы.

Маюць у страўніку 4 аддзелы — рубец, сетку, кніжку і сычуг (у некат. Ж. кніжкі няма). Корм раслінны. У працэсе яго перапрацоўлення вял. значэнне мае адрыжка і жвачка (адсюль назва) — перажоўванне корму, адрыгнутага з рубца і сеткі. Перажаваны і змочаны слінаю корм трапляе ў кніжку, потым у сычуг, сценкі якога выдзяляюць страўнікавы сок. Ж. маюць вял. карэнныя зубы; разцы і іклы толькі ў ніжняй сківіцы (замест верхніх шырокая рагавая мазалістая пласцінка). У многіх добра развітыя рогі.

Літ.: Млекопитающие Советского Союза, т. 1, М., 1961.

ЖВІР, г р а в і й, рыхлая горная парода, складзеная больш як на 50% з абгладжаных абломкаў парод памерам 1—10 *мм*, звычайна з прымессю пяску і галькі, радзей гліністага матэрыялу. Паводле паходжання бывае рачны (гл. *Алювій*), азёрны, марскі, ледавіковы. Здабываецца Ж. адкрытым спосабам; частка яго абагачаецца на драбільна-сартавальных з-дах. Ужываецца ў дарожным буд-ве, як запаўняльнік бетонаў, для фільтрацыйных пабудоў і інш.

На Беларусі пясчана-жвірова-галечны матэрыял пашыраны ў антрапагенавых адкладах і сканцэнтраваны пераважна ў межах Беларускай грады і Паазер'я. Разведана 59 радовішчаў з агульнымі запасамі 424,6 млн. м³, 28 з іх эксплуатуюцца. Найб. радовішчы (запасы ў тыс. м³, 1970): Баравое — 45 081 і Крулеўшчына — 28 595 (Глыбоцкі р-н), Скабін — 24 188 (Капыльскі р-н), Коханаўскае — 20 275 (Талачынскі р-н). Каля 85% пакладаў Ж. на Беларусі — ледавіковыя, астатнія — алювіяльныя. Форма залежаў лінзападобная, зрэдку пластавая; плошчы да 797,4 *га*; магутнасці да 35 *м*, а перакрывальных парод (з'ёму) ад 0—3 да 7—12 *м*, часам больш. Грануламетрычны састаў вельмі зменлівы (сярэдні: валуноў 0,4%, галькі 10—30, жвіру 20—30, пяску 40—70 і алеўрыта-гліністых фракцый 2—6%). Складаецца пераважна з абломкаў асадкавых, магматычных і метамарфічных парод.

І. Д. Несцяровіч. Мінск.

ЖГІРО́Ў Піліп Ерафеевіч [н. 11(24).11.1911, в. Гута Быхаўскага пав. Магілёўскай губ.],




Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1941. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1947), Вышэйшую ваен. акадэмію імя Варашылава (1955). У Чырв. Арміі з 1933. Удзельнік баёў з яп. захопнікамі на Халхін-Голе (1939). У Айч. вайну на Сталінградскім, Бранскім, Цэнтр. і 1-м Бел. франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля в. Вяле Камарынскага р-на Палескай вобл. 28.9.1943 стралк. полк, нач. штаба якога быў маёр Ж., каардынуючы ўзаемадзеянне пяхоты, артылерыі і авіяцыі, забяспечыў паспяховае наступленне і пад моцным агнём пераправіўся на правы бераг, выбіў непрыяцеля з траншэй, стварыў плацдарм для фарсіравання ракі інш. падраздзяленням. Жыве ў Ленінградзе.

ЖГУНСКАЯ БУ́ДА, вёска ў Добрушскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 10 *км* на Пд ад Добруша, 25 *км* ад Гомеля, 4 *км* ад чыг. ст. Зябраўка. 1469 ж., двароў 460 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. У кастр. 1943 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску. Помнік на брацкай магіле 57 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖГУНЬ, вёска ў Жгуна-Будскім с/с Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Жгунскі». За 12 *км* на Пд ад Добруша, 28 *км* ад Гомеля, 11 *км* ад чыг. ст. Добруш. 1115 ж., двароў 385 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У кастр. 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Помнік на брацкай магіле 16 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖГУЦІКАВЫЯ, ж г у ц і к а п о с ц ы (Mastigophora, Flagellata), клас прасцейшых арганізмаў. Каля 8000 відаў, пашыраных ва ўсім свеце.



1. Lamblia intestinalis, якая паразітуе ў кішэчніку чалавека. 2. Шарападобная калонія Eudorina elegans.

Даўж. цела Ж. 5 *мкм*—2 *мм*. На пярэднім канцы пераважна 1—8 *жгуцікаў*. Ядро адно, радзей некалькі. Цела ўкрыта пелікулай, хітынападобным панцырам ці абалонкай з клятчаткавых пласцінак. Некат. Ж. (напр., вольваксавыя) утвараюць калоніі, у якіх да 10 тыс. арганізмаў. Размнажаюцца простым дзяленнем папалам. Палавае размнажанне толькі ў фітамастыгінаў. Большасць жыве свабодна ў вадзе (уваходзяць у склад марскога і прэснаводнага *планктону*). Паразітычныя зоамастыгіны жывуць у целе раслін, жывёл і чалавека, многія выклікаюць хваробы (гл. *Сонная хвароба, Лейшманіёзы*).

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

У. П. Ляхновіч. Мінск.

ЖГУЦІКІ, ніткападобныя рухомыя плазматычныя выросты цела ў жгуцікавых, бактэрый, зааспораў, сперматазоідаў ніжэйшых і некат. вышэйшых раслін (імхоў, папарацяў, дзеразы), клетак некат. шматклетачных жывёл (напр., энтадэрмы губак), лічынкавых стадый кішачнаполасцевых і ігласкурых. Часам Ж. называюць хваставы аддзел сперматазоідаў жывёл і чалавека. Служаць пераважна для перамяшчэння ў вадкім асяроддзі.

ЖДА́НАЎ Андрэй Аляксандравіч [14(26).2.1896, г. Марыупаль Екацярынаслаўскай губ.— 31.8.1948], савецкі парт. і дзярж. дзеяч, ген.-палк. (1944). З сям'і інспектара нар. вучылішчаў. Чл. КПСС з 1915. Удзельнік рэвалюц. руху з 1912. Чл. Цвярскога к-та РСДРП(б) з 1916. У 1917 на вайск. службе, вёў рэвалюц. прапаганду сярод салдатаў. Пасля Лют. рэв. чл. палкавога к-та, старшыня Шадрынскага к-та РСДРП(б). Пасля Кастр. рэвалюцыі камісар земляробства Шадрынскага павятовага Савета. У 1918—20 на паліт. рабоце ў Чырв. Арміі на Урале і ў Цверы, рэдактар газ. «Тверская правда». З 1922 старшыня Цвярскога губвыканкома. У 1924—34 сакратар Ніжагародскага губкома, Горкаўскага крайкома ВКП(б). З 1934 сакратар ЦК, сакратар Ленінградскага абкома, гаркома ВКП(б). У Айч. вайну чл. Ваен. савета Ленінградскага фронту. З 1944 у апараце ЦК ВКП(б). З лют. 1935 канд. у чл., з сак. 1939 чл. Палітбюро ЦК ВКП(б). На XIV, XV з'ездах ВКП(б) выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XVI—XVIII чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 1—2-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі. Яго імем названы былы г. Марыупаль (1948).



ЖДА́НАЎ (да 1948 М а р ы у п а л ь), горад абл. падпарадкавання ў Данецкай вобл. УССР. Порт на беразе Азоўскага м., чыг. ст. 417 тыс. ж. (1970). Прамысл. металургічная, маш.-буд., буд. матэрыялаў, харч., лёгкая. Найбольшыя з-ды: металургічныя імя Ільіча і «Азоўсталь», цяжкага машынабудавання, коксахім., металаканструкцый, 2 суднаремонтныя, тэхнал. абсталявання для мед. прамысловасці. Кандытарская, швейная, пашчотная, сеткавязальная ф-кі, з-ды пракатна-штамповачны, механічны, радыятарны, «Электрабытпрылада», с.-г. машын, камбінаты буд. матэрыялаў, рыбаkансервавы, мясны. Металург. ін-т, вячэрне-завочны ф-т Адэскага ін-та інжынераў марскога флоту, 6 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 2 музеі (краязнаўчы і А. А. Жданава). Заснаваны Ж. у 1779.

ЖДА́НАЎ Мікалай Мікалаевіч [18.9(1.10).1902, чыг. ст. Алавяная Забайкальскай вобл.— 21.4.1966], савецкі ваенны дзеяч, генерал-палкоўнік артылерыі (1955), кандыдат ваенных навук, дацэнт. Беларус. З рабочых. Чл. КПСС з 1928. Скончыў Артылерыйскую акадэмію (1937). З 12 гадоў рабочы на бровары, на цагельні ў Маладзечне. У Чырв. Арміі з жн. 1919. У грамада. вайну ўдзельнік баёў супраць Дзянікіна і польскіх інтэрвентаў. З 1938 выкладчык, нач. кафедры ваен. акадэміі. У Айч. вайну на Ленінградскім фронце: камандзір палка, нач. штаба артылерыі арміі, фронту, камандуючы артылерыі арміі, камандзір корпуса. З 1944 нач. кафедры, факультэта, нам. начальніка і начальнік ваен. акадэміі. У 1955—65 у цэнтр. апараце Міністэрства абароны СССР. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.



В. С. Фядосенка. Масква.

ЖДА́НАЎ Павел Ільіч [н. 3(16).1.1903, Слонім Гродзенскай губ.], Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1955. Скончыў курсы пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1935). У Чырв. Арміі з 1925. У Айч. вайну на Бранскім і Цэнтр. франтах — камандзір стралковага палка. Удзельнік баёў на Курскай дузе, вызвалення Кромаў Арлоўскай вобл. Вызначыўся пры фарсіраванні Дясны, якую воінымі палка пераадолелі на двух участках, і Дняпра на Пн ад Кіева ў вер. 1943. Полк разам з партызанамі фарсіраваў Прыпяць і вызваліў Карпілаўку Чарнобыльскага р-на Кіеўскай вобл. Жыве ў Зэльве Гродзенскай вобл.



ЖДАНО́ВІЦКІЯ МІНЕРА́ЛЬНЫЯ КРЫНІ́ЦЫ, крыніцы мінеральнай вады, за 10 *км* на ПнЗ ад Мінска і за 1 *км* на Пн ад чыг. ст. Ждановічы, на правым беразе Свіслачы. Мінер. воды прымеркаваны да парыстых і шчылінаватых пясчанікаў і алеўралітаў верхняга пратэразою. Вада з глыб. 433—464 *м* паводле хім. саставу сульфатна-хларыдна-натрыевая, п'езаметрычны (напорны) узровень на глыб. 58 *м*, агульная мінералізацыя 11,5 *г/л*, т-ра 10,5 °С, pH 6,5; змяшчае ў невялікай колькасці бром, ёд, стронцый, жалеза

і інш. біялагічна актыўныя элементы. Вада з глыб. 320—379,6 *м* — хларыдна-натрыевая з павышанай колькасцю сульфатаў, п'езаметрычны ўзровень на глыб. 34,7 *м*, агульная мінералізацыя 3,5—4,5 *г/л*, т-ра 9,8 °С, pH 8,0. Воды выкарыстоўваюцца як пітныя лячэбныя пры лячэнні хвароб органаў стрававання. На базе Ж. м. к. утвораны Ждановіцкі бальнеалагічны курорт (гл. *«Крыніца»* і *Ждановічы*). *М. Ф. Казлоў.* Мінск.

ЖДАНО́ВІЧ Андрэй Фаміч [н. 9(21).1.1898, в. Нялідавічы Мінскага пав.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. Удзельнік Кастр. рэв. і грамадз. вайны. З 1923 на сав. і гасп. рабоце ў Бабруйску, у Старадарожскім р-не. У 1939 — жн. 1941 нам. старшыні Гомельскага аблвыканкома. У 1941—42 дырэктар з-да ў Краснаярску. З чэрв. 1943 чл. бюро *Гомельскага падпольнага абкома КП(б)Б*, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і ЦШПР па арганізацыі камуніст. падполля і партыз. руху на тэр. Гомельскай вобл. У 1943—55 старшыня Гомельскага, Бабруйскага, нам. старшыні Брэсцкага аблвыканкомаў. У 1959 упаўнаважаны ЦК КПСС у Казахстане. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Брэсце.

ЖДАНО́ВІЧ Генадзь Міхайлавіч (н. 8.3. 1933, Мінск), беларускі савецкі вучоны ў галіне парашковай металургіі. Д-р тэхн. н. (1970). Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1955). З 1962 ст. навук. супрацоўнік праблемнай лабараторыі парашковай металургіі Бел. політэхн. ін-та. Навук. працы па тэарэт. і эксперым. даследаваннях дэфармацыйнага механізма ўшчыльнення парашковых целаў, выяўленні заканамернасцей працэсу прасавання метал. парашкоў.

Тв.: Теория прессования металлических порошков, М., 1969.

ЖДАНО́ВІЧ Ірына Фларыянаўна [н. 14(27). 9.1906, Мінск], беларуская савецкая актрыса. Нар. арт. БССР (1940). Чл. КПСС з 1947. Дачка Ф. П. *Ждановіча*.



Сцэн. дзейнасць пачала ў Першым т-ве бел. драмы і камедыі (Данілка ў «Раскіданым гняздзе» Я. Купалы). У 1920—62 у Бел. т-ры імя Я. Купалы. Актрыса вялікага драм. тэмпераменту, высокай сцэн. тэхнікі. Майстар паказу жаночай псіхалогіі; стваральніца рамант., узнёслых вобразаў. Спачатку выконвала ролі хлопчыкаў і дзяўчынак: Юрка («Канец дружбы» К. Крапівы), Майка («Платон Крэчат» А. Карпейчука), Машачка («Машачка» А. Афінагенава), потым — драм. ролі маладых гераінь: Марылька («Бацькаўшчына» К. Чорнага), Насця («Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка), Джэнеўра («Глыбокія карэнні» Дж. Гоў і А. Д'Юса), Аня («Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона, Дзярж. прэмія СССР 1948). Ролі ў класічным рэпертуары: Вера («Апошнія» М. Горкага), Людміла, Негіна («Позняе каханне», «Таленты і паклоннікі» А. Астроўскага), Джульета («Рамэо і Джульета» У. Шэкспіра), Нора («Нора» Г. Ібсена). Апошнім часам выконвала характарныя ролі: Цётка («Шчасце паэта» В. Віткі), Настася Яфрэмаўна («У добры час!» В. Розава) і інш. Рэж. спектакляў: «Пупсовая кветачка» І. Карнавухавай і Л. Браўсевіча (1952), «Таня» А. Арбузава (1956), «Праз 20 гадоў» М. Святлова (1957). У 1962—69 педагог Бел. тэатр.-маст. ін-та. Дэп. Вярх. Савета БССР 2, 3 і 4-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Акцёрское мастацтва*.

Літ.: Няфёд У. Ірына Фларыянаўна Ждановіч, у зб.: Мастацтва Савецкай Беларусі, Мн., 1955; Рамановіч Я. Выдатная драматычная актрыса, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960; Куняцова К. Ірына Ждановіч, Мн., 1970.

Я. С. Рамановіч. Мінск.

ЖДАНО́ВІЧ Фларыян Паўлавіч [16(28).10. 1884, Мінск — 27.1.1942], беларускі савецкі акцёр, рэжысёр, тэатр. дзеяч. Адзін з заснавальнікаў бел. прафесійнага т-ра. Скончыў Варшаўскую драм. школу (1902). Працаваў акцёрам на польск. сцэне. З І. Буйніцкім, А. Бурбісам, У. Фальскім арганізоўваў бел. драм. гурткі (Мінск, Вільня, Слуцк, 1907—13). У 1917—20 у *«Беларускай хатцы»* ўзначальваў Першае т-ва бел. драмы і камедыі, у 1920—21 маст. кіраўнік, 1922—29 акцёр БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы). Адначасова рэж. Бел. сав. т-ра, драм. секцыі Бел. рабочага клуба; ставіў спектаклі ў Бел. рабочым т-ры імя ЦСПСБ. У рэж. работах шырока выкарыстоўваў бел. фальклор, сцэн. прыёмы нар. т-раў, імкнуўся да глыбокага раскрыцця сац. зместу, да рэаліст. трактоўкі твора. Пастаноўкі ў Першым т-ве і БДТ-1: «Паўлінка» і «Раскіданае гняздо» Я. Купалы, «Антось



Лата» Я. Коласа, «Ганка», «Апошняе спатканне», «Пісаравы імяніны», «Бязвінная кроў», «Залёты дзяка» і «Бязродны» У. Галубка, «Рысь» і «Хам» паводле Э. Ажэшкі, «Лес шуміць» паводле У. Караленкі, «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага, «Хата за вёскай» М. Старыцкага; у БДТ-3: «Кастусь Каліноўскі» Е. Міровіча (1929), «Ярасць» Я. Яноўскага (1930). Стварыў гратэскавыя вобразы Быкоўскага («Паўлінка»), ксяндза Яхідны («Панскі гайдук» Н. Бываеўскага), Даранта («Мешчанін у дваранах» Мальера); з інш. роляў — Сымон («Раскіданае гняздо»), Пеклянаў («Брацяпоезд 14-69» У. Іванава), Караваеў («Мяцеж» паводле Дз. Фурманава).

Літ.: Атрошчанка А. Фларыян Ждановіч, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.

Я. С. Рамановіч. Мінск.

ЖДАНО́ВІЧЫ, вёска ў Мінскім р-не, каля р. Свіслач. Цэнтр сельсавета. Чыг. ст. на лініі Мінск — Маладзечна. За 12 *км* на ПнЗ ад Мінска, на шашы Мінск — Заслаўе. 635 ж., гасп. 202 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Каля вёскі санат.-курортная зона.

ЖДАНО́ВІЧЫ, курорт рэспубліканск. значэння (БССР). Клімат сярэдне-кантынентальны. Зіма параўнальна мяккая. Сярэднегадавая



Санаторый «Ждановічы». Справа — галоўны корпус.

т-ра 5,3 °С. Сонечна 1650 гадзін у год. Асн. лекавы фактар — мінер. крыніцы з хларыдна-сульфатна-натрыевымі водамі сярэдняй мінералізацыі (для ваннаў і пітнога лячэння). У Ж. санаторыі «Ждановічы» на 400 месцаў (зімою на 200) і *«Крыніца»* на 500 месцаў, дом адпачынку «Беларусь». У санаторыі «Ждановічы» ёсць кабінеты дыягнастычныя і лячэбныя, кабіны бальнеалагічныя, грэзелячэбныя, ванны з душамі, выкарыстоўваюцца сапрапелевыя гразі азёраў на Дукорскім тарфяным масіве (Мінская вобл.). Лечаць хворых на хваробы органаў стрававання. Сезон увесь год.

Літ.: Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967; Курорты СССР, М., 1962.


Я. Ф. Калітоўскі. Мінск.

ЖДЗЕЛІ, вёска ў Відаскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр былога калгаса «Кастрычнік» (да 1971). За 46 *км* на ПдЗ ад Браслава, 276 *км* ад Віцебска, 36 *км* ад

чыг. ст. Гадуцішкі (Літ. ССР), на шашы Браслаў — Паставы. 173 ж., гасп. 66 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка.

«ЖИЗНЬ ПРОВИ́НЦИИ», штодзённая газета бурж.-ліберальнага кірунку, якая выдавалася ў Мінску з 11.4 да 18.5.1907 на рус. мове. Выходзіла замест закрытай царскімі ўладамі газ. *«Голос провинции»* (апошні нумар ад 8.4.1907) і рассылалася яе падпісчыкам. Прытрымлівалася прагрэс. поглядаў. Друкавала некаторыя матэрыялы Пятага (Лондонскага) з'езду РСДРП, перадавала змест прамоў яго дэлегатаў, у т. л. і бальшавікоў. Выступала супраць мясцовых акцябрыстаў-чарнасоценцаў і іх органа газ. *«Минское слово»*. Закрыта пад націскам царскіх улад. Выйшаў 31 нумар. Замест «Жизни провинции» стала выдавацца газета блізкага ёй кірунку *«Окраина»*. *Н. А. Сніцарава.* Мінск.

ЖЛО́Б, разнавіднасць беларускага народнага тэатра *батлейкі*. Пашыраны на Віцебшчыне ў 17 — пач. 19 ст. Спалучаў статычную лялькавую панараму з рухомым тэатрам ценяў. Узнікненне Ж. звязана са святам *калядаў* (жлобам на Віцебшчыне наз. яслі для кармлення жывёлы; паводле рэліг. міфа, Хрыстос у час нараджэння вешчуноў ляжаў у яслях). Ж. рабіўся ў выглядзе макета царквы з 2 паверхамі: ніжні меў 3 сектары (у сярэднім ставіліся нерухомыя лялькі — сцэна пакланення вешчуноў), верхні паверх — адзін. Верхні сектар і два ніжнія (бакавыя) заклейваліся прамасленай паперай — экранамі, за якімі ставіліся «вяртушкі» (рухала іх цяпло ад запаленай свечкі) з бляшанымі сілуэтамі («Уцёкі ў Егіпет», «Паход цара Ірада», «Падарожжа вешчуноў у Іерусалім»). Паказ Ж. суправаджаўся хорам. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Батлейка*.



Канструкцыя «вяртушкі» ў віцебскім жлобе.

Г. І. Барышаў. Мінск.

ЖЛО́БА Юлій Ягоравіч (н. 22.2.1931, в. Мядзведаўка Краснапольскага р-на, БССР), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1962. З 1954 у саўгасе імя Калініна Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл.: слесар, трактарыст, брыгадзір комплекснай брыгады, з 1968 звеннявы механізаванага звяна на вырошчванні бульбы. Дэлегат XXVII з'езду КПБ.

ЖЛО́БІН, горад абл. падпарадкавання, цэнтр Жлобінскага р-на Гомельскай вобл., прыстань на правым беразе Дняпра. Чыг. вузел. За 83 *км* на ПнЗ ад Гомеля. 26,2 тыс. ж. (1971). Прамысловасць: харчовая, лёгкая, металаапрацоўчая. Прадпрыемствы: птушкакамбінат, хлебазавод, малочны, камбікормавы, пладова-агародніны з-ды; ф-кі — швейная, маст. інкрустацыі і мэблевая, пяньковы з-д, камбінаты буд. матэрыялаў і быт. абслугоўвання; з-д рамонту буд. і дарожных машын,



Жлобін. Вуліца Першамайская.

раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, спецыялізаванае аддз. Сельгастэхнікі. Будуецца (1971) малочны з-д. 7 сярэдніх, 2 пач. школы, 2 школы рабочай моладзі, завочная, муз. і спарт. школы, 13 дашкольных устаноў. Дом піянераў, кінатэатр, Дом культуры, клуб чыгуначнікаў, 4 масавыя б-кі, 2 бальніцы, 2 паліклінікі, лёгачнатуберкулёзны санаторый для падлеткаў.

Упершыню ўпамінаецца ў 15 ст. як невял. паселішча; належала Хадкевічам. З 1793 у складзе Рас. імперыі, мяст. Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ. 2100 ж., паводле перапісу 1897. У канцы 19 ст. праз Ж. пракладзена Лібава-Роменская чыгунка, у 1902 чыгунка Пецярбург — Адэса. У снеж. 1905 адбылася ўсеагульная забастоўка чыгуначнікаў, рабочыя на некалькі дзён захапілі ўладу. Сав. ўлада ўстаноўлена ў ліст. 1917. У канцы студз. 1918 пад Ж. Чырв. Армія разбіла асн. часці 1-га польскага корпуса Доўбар-Мусніцкага. У лют.— ліст. 1918 акупаваны нямец. войскамі. З мая 1918 барацьбу з акупантамі ўзначаліў Жлобінскі падпольны к-т РКП(б). У чэрв. 1919 па мітынгу працоўных Ж. выступаў М. І. Калінін. У час акупацыі нямец.-фаш. захопнікамі (жн. 1941—26.6.1944) разбураны. У Ж. дзейнічалі падпольны райком КП(б)Б і падпольная камсамольская арг-цыя.

Да Кастр. рэв. меў невыразную аднапавярховую забудову. Сучасны Ж.— адзін з перспектыўных гарадоў рэспублікі. Цэнтр размешчаны каля чыг. вакзала, дзе пабудаваны клуб, гасцініца, будынкі райвыканкома, райкома КПБ, Дом сувязі. Помнік сав. воінам 21-й арміі, якія загінулі пры вызваленні Ж. Ген. план (1966, арх. М. Штанько, Я. Ліпевіч) прадугледжвае стварыць новы адм.-культ. цэнтр і зону адпачынку каля Дняпра.

Т. С. Мядзведзева, А. С. Ажінчыц. Мінск.

ЖЛОБІНСКАЯ СЕДЛАВІНА, тэктанічная структура на ўсходзе БССР. Аддзяляе Беларускі крышталічны масіў ад Варонежскай антэклізы і злучае Прыпяцкую і Аршанскую ўпадзіны. Цягнецца з Пн на Пд. Глыбіня залягання крышталічнага фундаменту каля 900 *м* і больш. Седлавіна запоўнена верхнепратэразойскімі, дэвонскімі і меза-кайназойскімі адкладамі.


Верхні пратэразой Ж. с. складзены з рагачоўскай, аршанскай і пінскай світ аў рыфею, з вільчанскай і месцамі валынскай серый венду; дэвон — з пляускага, пароўскага і старабарскага гарызонтаў сярэдняга аддзела; мезазой — з сярэдне- і верхнеюрскіх, ніжне- і верхнемелавых адкладаў. У паўд. ч. седлавіны, дзе фундамент паглыблены, разрэз палеазойскіх адкладаў больш поўны. Фарміраванне паўн. і паўд. ч. седлавіны адбывалася ў розны час і цесна звязана з развіццём прылеглых упадзін. Будова паверхні фундаменту адлюстроўваецца ў сучасным рэльефе і ў размеркаванні рачной сеткі (амаль праз цэнтр. частку седлавіны цячэ Дняпро).


З. А. Гарэлік. Мінск.

ЖЛОБІНСКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924. На ПнУ вобласці, абапал Дняпра. Пл. 2,1 тыс. *км²*. Нас. 82,0 тыс. чал. (1971, з Жлобінам). Падзяляецца на 19 сельсаветаў; гар. нас. Стрэшын. Цэнтр г. Жлобін.

Раён размешчаны ў межах *Гомельскага Палесся* (частка Прыдняпроўскай нізіны). Пераважныя выш. 125—135 *м* над узр. м. Карысныя выкапні: 3 радовішчы торфу з запасамі 40,5 млн. *т*, у т. л. радовішчы Стрэшына-Мормальскае — 28,7 млн. *т* і Дубоўка — 8,1 млн. *т*; Жлобінскае радовішча фармовачных пяскоў — 0,2 млн. *т*, 7 радовішчаў цагельнай сыравіны — 11,6 млн. *м³*, у т. л. радовішчы Ельнік (непадалёку ад в. Праскурні) — 7,9 млн. *м³*, Ліпы — 2 млн. *м³* і Баршчоўка — 0,7 млн. *м³*. Сярэдняя т-ра студ. —6,9, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 594 *мм* за год. Вегет. перыяд 193 дні. Рэкі: Дняпро з Бярэзінай, якая цячэ на Пд раёна, па мяжы з Светлагорскім і Рэчыцкім р-намі; невялікія прытокі Дняпра — Дабасна (справа), Ржаўка, Окра (злева); Ала (левы прыток Бярэзіны). Глебы с.-г. угоддзяў дзярнова-падзолістыя (48,5%), у т. л. часова залішне ўвільготненыя (13,6%); дзярнова-падзоліста-глеяватыя і дзярнова-падзоліста-глеевыя (8,5%), дзярнова-глеяватыя і дзярнова-глеевыя (11,9%), тарфяна-балотныя (12,2%), алювіяльныя (17,8%) і інш. З мінер. глебаў 19% суглінкавых, 50,4 супясчаных, 30,6% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: worных зямель — 46 (цана бала 0,26 *ц/га* збожжа), кармавых угоддзяў — 32, усіх с.-г. угоддзяў — 40. Пад лесам 28% тэр. Асн. лясныя масівы на У і Пд раёна, пераважаюць хваявыя, на Пд — з прымессю вольхі і асіны. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, яўрэі і інш. Сярэдняя шчыльн. 39 чал. на 1 *км²* (з Жлобінам). Гарадскога нас. 34,1%.

Прамысловасць: паліўная — торфабрыкеты з-д «Луцкае», харчовая — птушкакамбінат, хлебазавод, малочны, пладова-агародніны і камбікормавы з-ды (Жлобін), 2 крухмальныя з-ды (Чырвоны Бераг, Стрэшын), 3 невял. малочныя з-ды (Шчадрын, Папаратнае, Лугавая Вірня), будуецца (1971) малочны з-д у Жлобіне; лёгкая — ф-кі





Ачыстка збожжа на Жлобінскім збожжапрыёмным пункце.

маст. інкрустацыі, швейная і мэблевая, пянькоў з-д, камбінат быт. абслугоўвання (Жлобін); металаапрацоўчая — з-д для рамонту буд. і дарожных машын, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, спец. аддз. Сельгастэхнікі (Жлобін); буд. матэрыялаў — камбінат буд. матэрыялаў (5 цагельных з-даў: Жлобін, Стрэшын, Шыхаў, Баршчоўка, Шчадрын), кар'ер «Фармпяскі»; лясгас. Значная частка насельніцтва працуе на чыг. транспарце. У раёне 20 калгасаў і 12 саўгасаў (1971).

Калгасы і іх цэнтры: «Бярэзіна» *(Новыя Маркавічы)*, імя Варашылава *(Шчадрын)*, імя Жданава *(Акцябр)*, «Зорка» *(Прыбудак)*, «Іскра» *(Папаратнае)*, імя Калініна *(Радуша)*, «Камуніст» *(Кабанаўка)*, імя Кірава *(Старая Рудня)*, імя Леніна (Дворышча), «1 Мая» *(Стрэшын)*, «Прагрэс» *(Сцяпы)*, «Праўда» *(Верхняя Алба)*, «50 гадоў БССР» *(Праскурні)*, «Радзіма» *(Кароткавічы)*, «Светлы шлях» *(Вялікі Лес)*, «Світанне» *(Майскае)*, імя Свярдлова *(Кірава)*, «Чырвоная зорка» *(Кіцін)*, «Шлях Леніна» *(Касакоўка)*, імя Энгельса *(Плесавіцкая Слабодка)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Бабоўскі» *(Бабоўка)*, «Жлобін» *(Саланое)*, імя Казлова *(Малевічы)*, «Луцкі» *(Новыя Лукі)*,



Птушкаферма ў саўгасе «Жлобін».

«Мормаль» *(Дабрагошча)*, «Нівы» *(Нівы)*, «Пінчэвіцкі *(Пінчэвічы)*, «Скяпянскі» *(Скепня)*, «Уперад» *(Мормаль)*, «Чырвонабярэжскі» *(Прыстань)*, «Шлях да камунізма» *(Рэкта)*, саўгас-тэхнікум *(Чырвоны Бераг)*.

С. гасп. спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве; вырошчваюць бульбу і збожжа. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 55% тэр. На пач. 1971 асушана 22,4 тыс. *га* балот і забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 66,5, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі 26,5, тэхнічнымі 2,3, бульбай 12,1, кармавымі культурамі 25,1. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 64,9 (у т. л. кароў 29,5), свіней 42,4, авечак і коз 6,4. Па тэр. раёна праходзяць чыгункі Орша — Калінкавічы, Мінск — Гомель. Жлобін — важны чыг. вузел. Аўтамаб. дарогі Гомель — Жлобін — Бабруйск, Рагачоў — Жлобін — Рэчыца (ідзе рэканструкцыя), Парычы — Чырвоны Бераг. У межах раёна суднаходныя Дняпро і Бярэзіна.

У 1971 у раёне было (з Жлобінам) 25 сярэдніх, 23 васьмігадовыя, 62 пач. школы, 3 школы рабочай і сельскай моладзі, завочная школа, 22 дашкольныя ўстановы, 63 клубныя ўстановы, 68 масавых б-к, 64 кінаўстаноўкі (у т. л. 58 стацыянарных), 9 бальніц, 2 паліклінікі, 33 фельч.-ак. пункты, лёгачнатуберкулёзны санаторый для падлеткаў. У раёне (на пач. 1971) 1318 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 187 інжынераў, 152 аграномы, заатэхнікі і вет. ўрачы, 67 эканамістаў, 13 таваразнаўцаў, 776 настаўнікаў, 95 урачоў і інш.; 2665 чал. з сярэдняй спец. адукацыяй. Газ. «Камуніст», раённая і гарадская.

С. В. Курач. Мінск.

ЖЛУТКОЎ Калінік Іванавіч (8.11.1897, в. Заполле Бабруйскага пав.— 21.8.1969), удзельнік грамадз. вайны на Беларусі, узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга (1920). З сялян. Чл. КПСС з 1919. Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1919 у Чырв. Арміі на Зах. фронце, камандзір батальёна 8-й стралк. дывізіі, пазней у органах ВЧК. З 1923 на сав. рабоце ў Беларусі. З 1932 у Чырв. Арміі, удзельнік Айч. вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

ЖМУДЗЬ, назва старажытнага літоўскага племя *жэмайты*.

ЖМУДСКІ КОНЬ, старажытная лясная парода коней, выведзеная ў 14 ст. ў Літве (Жмудзь). З 19 ст. паляпшалася арабскай, дацкай, арлоўскай і інш. пародамі. На яе аснове створана новая парода — жэмайчу.

На Беларусі разводзяць з 19 ст. Сярэднія прамеры жарабцоў (у см): выш. ў карку 146—150, косая даўж. тулава 149—153, абхват грудзей 164—176, абхват пясці 19—21; жывая маса 420—500 *кг*; кабыл адпаведна: 139—148; 143—152; 157—168; 18,2—19; 387—422 *кг*. Масць гнядая, буланая, рудая. Ж. к. вынослівы ў рабоце, непатрабавальны. Добры паляпшальнік палескіх і лясных коней. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Конегадоўля*.

Літ.: Гл. пры арт. *Конегадоўля*.

ЖМУРНЯ, канал, правы прыток р. Убарць (бас. Прыпяці). Даўж. 24 *км*. Знаходзіцца ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. Вадазбор (148 *км²*) — плоская забалочаная аблесеная раўніна. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,5 *м³/сек*. Выкарыстоўваецца пры меліярацыі.



ЖМУРОЎСКІ Дамітрый Пятровіч (н. 10.1. 1918, в. Барысавічы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.), Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1946. У 1938—41 вучыўся ў Магілёўскім пед. ін-це. У Чырв. Арміі з 1941. У Айч. вайну на Бранскім, Калінінскім, 2-м Укр. франтах — камандзір кулямётнага разліку.

Удзельнік Корсунь-Шаўчэнкаўскай і Яска-Кішынёўскай аперацый. Вызначыўся пры фарсіраванні Прута. Кулямётны разлік Ж. адзін з першых пераправіўся на правы бераг і ў баях за плацдарм адбіў 20 контратак. Паранены, не пакінуў бою. Канд. гістар. н. (1950). З 1960 выкладчык БДУ. Аўтар кнігі «Арганізатарская работа Камуністычнай партыі ў вёсцы (1918—1920 гг.)» (1970).

ЖНІВЕНЬ, восьмы месяц каляндарнага года (31 дзень), канец лета. Бел. назва паходзіць ад жніва, важнай падзеі ў жыцці земляроба. Укр. серпень і польскае sierpień — ад назвы серп, што таксама звязана са жнівом. Рус. назва месяца август і ням. August паходзяць ад лац. Augustus — ганаровае імя рымскага імператара *Аўгуста*.

На Беларусі сярэдняя даўж. дня ў Ж. 14 *гадз* 56 *мін*, вышыня Сонца над гарызонтам 49,7°, сумарная сонечная радыяцыя за месяц 11 *ккал/см²*, радыяцыйны баланс дадатны (5,9 *ккал/см²*), сярэднемесячная т-ра паветра 16,2, абс. макс. 33 (1901), абс. мінім. 2 °С (1899). Сярэднемесячная т-ра вады рэк і азёраў 18—20 °С, ападкаў 60—100, найчасцей 82 *мм* за месяц. У Ж. канчаецца жніво азімых, убіраюць яравыя, іржуць і рассцілаюць лён. З сярэдзіны месяца пачынаецца сяўба азімых жыта і пшаніцы. Даспявае садавіна, у разгары збор брусніц, каснянiц, ажыны. Ж.— самы багаты месяц на грыбы. Адлятаюць у вырай стрыжы, ластаўкі, вязюлі, іволгі, мухалоўкі, гарыхвосткі, валасянкі, чарацянкі; збіраюцца ў чароды шпакі, гракі. Размнажаюцца змеі і яшчаркі. Пачынаецца гон (шлюбны перыяд) у казуль, нараджаюцца зайчаняты (другі прыплод).

Літ.: Шкляр А. Х. Календарь природы Белоруссии, Мн., 1967.

«ЖНІВЕНЬСКАЯ» 1913 НАРАДА ЦК РСДРП З ПАРТЫЙНЫМІ РАБОТНІКАМІ, гл. *Паронінская 1913 нарада ЦК РСДРП з партыйнымі работнікамі.*

ЖНІВЕНЬСКАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ 1945 у В'етнаме, нацыянальная народна-дэмакратычная рэвалюцыя, якая скінула панаванне імперыялістаў у В'етнаме і ўстанавіла нар.-дэмакр. ўладу. З'явілася вынікам развіцця нац.-вызв. руху ў краіне супраць франц. каланізатараў, якія падпарадкавалі сабе В'етнам у 50—80-я г. 19 ст., і яп. акупантаў, што захапілі В'етнам у 1940. Адбылася ва ўмовах пераможнай вайны Сав. Саюза супраць імперыялістаў. Японіі. Зрабіла вял. ўплыў на развіццё нац.-вызв. руху ў Паўд.-Усх. Азіі, перш-наперш у Лаосе і Камбоджы.

Падрыхтоўкай і ажыццяўленнем Ж. р. кіравала Камуніст. партыя Індакітая (КПІК; з 1951 *Партыя працоўных В'етнама*). Рашэнне пачаць усеагульнае паўстанне прынята на нац. канферэнцыі КПІК 13—15.8.1945 і ўхвалена 16 жн. на Усев'етнамскім нац. кангрэсе В'етміня (Ліга барацьбы за незалежнасць В'етнама, створана 19.5.1941, згуртавала ўсе патрыят. сілы краіны). Па закліку КПІК 16 жн. ва ўсёй краіне пачалося паўстанне. 19 жн. паўстанцы захапілі Ханой, 23 жн. Хюэ і 25 жн. Сайгон. Пад націскам рэвалюц. мас імператар Бао-Дай 24 жн. адрокся ад трона. У ходзе Ж. р. быў знішчаны каланіял. апарат і створаны новыя, дэмакр. органы кіравання ў гарадах і сёлах. 2.9.1945 на 500-тысячным мітынгу ў Ханоі *Хо Шы Мін* ад імя Часовага ўрада абвясціў Дэкларацыю незалежнасці В'етнама і ўтварэнне Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам (ДРВ).

Літ.: Разобьем оковы. Документы Августовской революции 1945 г. во Вьетнаме, пер. с франц., М., 1960; Хо Ши Мин. Избр. статьи и речи, пер. с вьетн. и франц., М., 1959.

ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ, «жніво», частка летняга цыкла каляндарна-земляробчага фальклору. Пашыраны ў многіх земляробчых народаў. На Беларусі — узор традыцыйнай сялянскай народна-песеннай класікі. Выконваюцца звычайна жанчынамі. Падзяляюцца на зажынкавыя (пачатак жніва), уласна жніўныя і дажынкавыя (канец жніва) песні.

Гал. жанрава-тэмат. групу складаюць уласна жніўныя прац. песні, пашыраныя на ўсёй тэр. Беларусі. Ім уласцівая працоўная, сямейна-бытавая і любоўна-лірычная тэматыка; у часы прыгону ў Ж. п. больш, чым у інш. каляндарна-земляробчых, выявілася антыпрыгонніцкая накіраванасць. Паэт. вобразы вылучаюцца псіхал. тонкасцю і адначасова яркасцю бытавых замалёвак. Найчасцей Ж. п.— гэта маналог жнеі, які ўключае зварот да сонца, ветру, хмар. Выразныя, разнастайныя ў эмацыянальна-вобразным сэнсе напевы Ж. п. пры невялікім гукавым дыяпазоне (найчасцей тэрцыя з захопліваннем ніжняй кварты) уражаюць меладычнай шырынёй з прычыны доўга працягнутых апорных гукаў ладу, свабоднай імправізацыйнай рытмікі, інтанацыйнай гібкасці, багатай меліматыкі. У паўд. (Палессе) і ўсх. раёнах Беларусі Ж. п. гучаць драматычна напружана, у паўн. пераважна лірычна, у зах. часта маюць эпічныя рысы. У многіх мясцінах Беларусі Ж. п. збліжаюцца і нават зліваюцца з касарскімі песнямі (напевы, якія абыдноўваюць жніўныя і касарскія песні, наз. «лета»). Большасць зажынкавых і дажынкавых маюць святочны, велічальны характар. Ад уласна жніўных яны адрозніваюцца меншай распеўнасцю, рытмічнай акрэсленасцю. Суправаджаюцца звычаямі «першага снапа» (зажынкавыя), «апошняга снапа» і «завівання барады» (дажынкавыя).


Публ.: Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края, т. 1, ч. 1, СПб., 1887; Песні беларускага народа, Мн., 1940; Белорусские народные песни, М.— Л., 1941 (Песни народов СССР); Беларускія народныя песні, запіс Р. Шырмы, т. 3, Мн., 1962; Анталогія беларускай народнай песні, Мн., 1963 (№ 44—51).

Літ.: Яплатаў В. Ладава-меладычныя асаблівасці беларускіх жніўных песень, у зб.: Беларускае мастацтва, Мн., 1960; Лісс А. С. Жніўныя песні, у зб.: Праблемы сучаснага беларускага фальклору, Мн., 1969; Эвальд З. В. Социальное переосмысление жнивных песен белорусского Полесья, «Советская этнография», 1934, № 5; Мажэйка З. Я. Жніўная песня беларускага Палесся, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1968, № 2.

З. Л. Мажэйка. Мінск.

ЖНІЯРКА, машына для скошвання збожжавых, зернебабовых і крупяных культур пры ўборцы іх раздзельным спосабам.

Падзяляюцца Ж. на радковыя (арэзаная збажына ўкладваецца на ржышча радкамі); лабагрэйкі (збажына збіраецца на платформе і ўручную скідваецца кучкамі); Ж.-самаскідкі (аўтаматычна скідваецца в платформы кучкамі); снопавязалкі (звязваецца ў снапы). Найб. пашыраны радковыя Ж. з трактарнай цягай: прычэпныя ЖРС-4,9А (агрэгатуюцца з трактарам «Беларусь»), навясныя ЖВН-10, ЖВН-6 (з самаходнымі камбайнамі). Асн. рабочая частка Ж.— рэзальны апарат (гл. рыс.). Ж. абсталёўваюцца матавілам або грабельным апаратам, які ўкладваюць арэзаную збажыну на транспарцёр (снопавязалкі, радковыя Ж.) ці платформу (лабагрэйкі, самаскідкі). Рабочыя органы Ж. прыводзяцца ў дзеянне ад ле хадавога колы або рухавіка трактара. Уборка Ж. менш прадукцыйная і дае большыя страты зерня, чым камбайнавая. Выкарыстоўваюцца Ж. пры скошванні недаспелага збожжа (ранняе жніво або нераўнамернае высяванне пасеваў), на моцна зарослых участках, пры дажджлівым надвор'і і інш. Пашыраны ў нечарназёмнай палосе.



Рэзальны апарат жніярак: *1* — нерухомыя пальцы; *2* — нож, які робіць зваротна - паступальны рух; *3* — брус, да якога прымацоўваюцца пальцы.

Літ.: Барсуков А. Ф. и Еленев А. В. Краткий справочник по сельскохозяйственной технике, М., 1968; Сельскохозяйственная техника. Каталог, 3 изд., М., 1967. *В. І. Лосеў.* Мінск.

ЖОДЗЕНЬ, возера ў бас. р. Свіны, правага прытока Обалі, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,5 *км²*. Даўж. 1,1 *км*, найб. шыр. 0,9 *км*, сярэдняя 0,5 *км*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Усх. схілы разараны, зах. ўкрыты мяшаным лесам. Вадазбор (62,3 *км²*) узгорыста-марэнны. Праз возера працякае р. Чарнец (Копань). Водзяцца лешч, плотка, шчупак, верхаводка і інш.

ЖОДЗІНА, горад абл. падпарадкавання ў Мінскай вобл., на р. Пліса. Чыг. ст. За 55 *км* на ПнУ ад Мінска. 23,4 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: *Беларускі аўтамабільны завод* (БелАЗ), ДРЭС (магутнасць да 100 тыс. *квт*), камбінат быт. абслугоўвання. *Земляробства Беларускі навукова-даследчы інстытут, Жывёлагадоўлі Беларускі навукова-даследчы інстытут*, філіял вячэрняга агульнатэхн. ф-та Бел. політэхн. ін-та, вячэрні філіял Мінскага аўтамех. тэхнікума, гар. прафесійна-тэхн. вуч.; 4 сярэднія школы, 2 школы рабочай моладзі, сярэдняя школа-інтэрнат, пач. школа, 10 дашкольных устаноў, муз. і спарт. школы, Дом піянераў, 2 масавыя б-кі, кінатэатр, 2 Палацы культуры, клуб, гар. бальніца, абл. племянная станцыя. Помнікі У. І. Леніну і Герою Сав. Саюза П. І. *Купрыянаву*, 2 помнікі на брацкіх магілах сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

Да Вял. Айч. вайны Ж.— вёска Смалявіцкага р-на Мінскай вобл., чыг. станцыя. 21.1.1958 вёска ператорана ў гарадскі пасёлак з уключэннем у яго склад Смалявіцкай ДРЭС і з-да дарожных і меліярац. машын, вёсак Зарэчча і Крушынікі. У 1958


Жодзіна. Школьны комплекс і жылыя дамы ў мікрараёне № 2.

у Ж. пабудаваны Бел. аўтамаб. з-д (БелАЗ). З 7.3.1963 горад абл. падпарадкавання. Пасля вайны ў Ж. пабудаваны вял. жылыя комплексы з установамі быт. абслугоўвання, сталовыя, кафэ, адм. будынкі. У ген. плане (1966, арх. Э. Даямідаў) распрацавана арганізацыя агульнагар. цэнтра, месцаў адпачынку, гар. транспарту.

ЖОДЗІШКІ, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл., на правым беразе Віліі. Цэнтр сельсавета і калгаса «Запаветы Леніна». За 20 *км* на Пн ад Смаргоні, 280 *км* ад Гродна, на шашы в. Войстам — в. Варняны. 794 ж., двароў 276 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, дзіцячы сад, 2 бальніцы, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 4 магазіны. Помнік 8 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖОЛУДЗЕЎ Віктар Рыгоравіч [9(22).3.1905, Угліч Яраслаўскай губ.— 21.7.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1921. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 23.6.1944 стралк. корпус пад камандаваннем ген.-маёра Ж. фарсіраваў Друць каля в. Азяраны Рагачоўскага р-на, перарэзаў шашу Магілёў — Бабруйск, фарсіраваў Ольсу і Бярэзіну, вызваліў Клічаў і Бярэзіно, вёў наступленне ў напрамку Мінска. Загінуў каля Ваўкавыска.


ЖОЛУДЗЕЎ Навум Ільіч (н. 13.1.1922, Гомель), Герой Сав. Саюза (1943). З рабочых. Чл. КПСС з 1944. Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1950). У Чырв. Арміі з 1941. У Айч. вайну малодшы сяржант, камандзір мінамётнага разліку. Удзельнік баёў у Сталінградзе, на Курскай дузе, Украіне, у Румыніі. Мінамётны разлік на чале з Ж. вызначыўся ў кастр. 1943 пры фарсіраванні Дняпра каля в. Келебярда на Пд ад Кременчуга. Воіны заглушылі агнявыя кропкі ворага і авалодалі плацдармам на правым беразе. Служыць у Сав. Арміі.



ЖОРНАЎСКАЯ ЛЯСНАЯ ДОСЛЕДНАЯ СТАНЦЫЯ Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі, навукова-даследчая ўстанова; распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні лясной гасп. ў зоне ялова-грабовых дуброў Магілёўскай і Мінскай абл. Засн. ў 1924 у пас. Дуброва Асіповіцкага р-на Бабруйскай акр. Дырэктар канд. с.-г. н. А. П. Дацэнка (з 1965). Станцыя мае лясны гідраметэаралагічны стацыянар. Асн. кірункі даследаванняў: павышэнне прадукцыйнасці лясоў у зоне дзейнасці, распрацоўка сістэм і спосабаў высечак лесу.

Выдадзены працы: «Прыродныя ўмовы і інтэнсіўнасць гаспадаркі ў дубровах эксперыментальнай базы Жорнаўскай лясной доследнай станцыі» П. Д. Чарвякова (1957), «Тэзісы дакладаў сесіі навуковага савета Жорнаўскай ЛДС па выніках работ і абмену вопытам (22—23 кастрычніка 1964)».

ЖОРНЫ, прыстасаванне для ручнога памолу зерня. Рабілася з 2 круглых камянёў дыяметрам 40—50 *см* і таўшчынёю 12—15 *см*. Верхні камень круціўся на метал. шпіні, прапушчаным вертыкальна праз цэнтр перухомага ніжняга. На Беларусі былі пашыраны Ж. з доўгім драўляным млёнам (ручкаю), верхні канец якога ўстаўляўся ў перакладзіну над камянямі. Зерне засыпалася ў круглую адтуліну верхняга каменя. Мліва — му-



ка ці крупы — ссыпалася ў скрыню, змайстраваную на высокіх ножках.

ЖОРТАЙ, вёска ў Майсеёўшчынскім с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Чырвонапартызанскі». За 52 *км* на Пн ад Барысава, 126 *км* ад Мінска. 273 ж., гасп. 76 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1942 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску. Мемарыяльная дошка ў гонар штаба партыз. брыгады імя Кірава, які размяшчаўся ў вёсцы ў Айч. вайну.

ЖОЎПІНА, вёска ў Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ленінскі шлях». За 7 *км* на У ад Верхнядзвінска, 153 *км* ад Віцебска, 4 *км* ад чыг. ст. Свольна. 217 ж., гасп. 65 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 49 землякам, брацкая магіла 34 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖОЎТАЕ МОРА, паўзамкнёнае мора Ціхага ак. паміж п-вам Карэя і берагамі Кітая. Пл. 417 тыс. *км*². Найб. глыб. 106 *м*, сярэдняя 40 *м*. Самыя вял. залівы: Бахайвань, Ляадунскі і Зах.-Карэйскі. У Ж. м. ўпадаюць р. Хуанхэ, Хайхэ, Ляохэ, Ялуцзян.

Клімат субтрапічны, мусонны. Сярэдняя т-ра вады па паверхні: ніжэй 0 на ПнЗ, 6—8 °С (люты) на Пд; ад 24 на Пн да 28 °С на Пд (жнівень). Паўн.-зах. частка Ж. м. з ліст. да сак. замярзае. Салёнасць ад 30‰ і менш на ПнЗ, да 33—34‰ на ПдУ, каля вусця ў рэк паніжаецца да 26‰. Прылівы паўсутачныя, выш. да 9 *м* (каля берагоў Карэі). У Ж. м. водзяцца селядзец, марскі лешч, траска, вугор, мідыі, вустрыцы. Найб. порты ў Кітаі — Цяньцзінь, Інкоў, Цындао, Далянь (Дальні), Люйшунь (Порт-Артур), у Карэі — Інчхон (Чэмульпо).

ЖОЎТАЕ ЦЕЛА, залоза ўнутранай сакрэцыі, якая перыядычна паяўляецца ў *яечніку* млекакормячых жывёл і чалавека на месцы граафавага пузырка пасля выхаду з яго яйцаклеткі.

Думку пра тое, што Ж. ц.— залоза ўнутр. сакрэцыі, выказаў рус. вучоны У. В. Падвысоцкі (1896). Адрозніваюць Ж. ц. менструальнае (у жанчын функцыянуе 10—12 дзён) і цяжарнасці. Гармон Ж. ц. прагестэрон затрымлівае выспяванне новых яйцаклетак, стымулюе развіццё малочных залоз, садзейнічае ўтрыманню цяжарнасці.

Літ.: Гл. пры арт. *Яечнік*.

ЖОЎТА-ЗЯЛЁНЫЯ ВОДАРАСЦІ, разнажгуцікавыя водарасці (Xanthophyta або Heterocontae), тып (аддзел) *водарасцяў*.

Адна-, шматклетачныя, няклетачныя каланіяльныя арганізмы разнастайнай формы. Рухомыя, пасіўна плаваюць або прымацаваныя да субстрату. Зааспоры нерухомых відаў і некат. рухомыя віды маюць па 2 жгуцікі рознай даўж. і будовы. Абалонка клетак з пекцінавымі рэчывамі. Колер ад светла- да цёмна-жоўта-зялёнага. Запасныя рэчывы — алеі, лейказін, валюцін. Размнажаюцца Ж.-з. в. вегетатыўна; палавае размнажэнне (ізагамія) — выключэнне. Вядома больш за 350 відаў, пашыраных у прэсных, радзей у марскіх водах і глебе. Найб. вядомыя: гетэрахлорыс, батрыдыопсіс, трыбанема, батрыдыум. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Водарасці*.

Літ.: Гл. пры арт. *Водарасці*.

ЖОЎТАЯ ЛІХАМАНКА, вострая вірусная хвароба чалавека. Перадаецца камарамі роду Aëdes. Пашырана ў Цэнтр., Паўд. Амерыцы і Зах. Афрыцы. Міжнар. сан. канвенцыі прадугледжваюць сан. мерапрыемствы, каб не дапусціць пашырэння Ж. л. з эндэмічных ачагоў (гл. *Геаграфія медыцынская*).

Інкубацыйны перыяд 3—9 дзён, пасля паяўляецца ліхаманка, т-ра цела павышаецца да 39—41 °С і трымаецца 10—12 дзён, баліць галава і мышцы, пашкоджваюцца ныркі, печань (жаўтуха), крывяносныя сасуды (крывазліццё пад скуру і ва ўнутраныя органы, ірвота з крывёю). Лячэнне сімптаматычнае. Прафілактыка: знішчанне пераносчыкаў хваробы, вакцынацыя.

Літ.: Гл. пры арт. *Інфекцыйныя хваробы, Інфекцыя*.

ЖОЎТАЯ СІТАЎКА (Motacilla flava), птушка сям. сітаўкавых атр. вераб'іных. Пашырана ў Еўропе, Азіі, Афрыцы і Паўн. Амерыцы. На Беларусі нар. назвы: валасенчык, валасяначка, жоўтая пліска.

Маса каля 20 *г*. Нагадвае *белую сітаўку*, але мае жоўтае брушка. Гняздуецца на сырых лугах і балотах. Нясе 4—6 яец. Корміцца насякомымі.

Літ.: Гл. пры арт. *Сітаўкавыя*.

ЖОЎТЫ БРОД, вёска ў Доўгаўскім с/с Салігорскага р-на Мінскай вобл., каля р. Случ (1,5 *км*). Цэнтр калгаса «Праўда». За 29 *км* на Пд ад Салігорска, 162 *км* ад Мінска. 262 ж., гасп. 65 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін.

ЖОЎЦЕВЫ ГРЫБ, воўчы грыб (Tylopilus felleus), грыб сям. балетусавых. На Беларусі расце ў хвойных лясах у ліп.— верасні. Неядомы, можа выклікаць атручэнне.



Шапка 3—8 *см* у дыяметры, круглавата-падушкападобная, сухая, бураватая. Мякаць белая, мяккая, на зломе ружавее, вельмі горкая. Ножка разбухлая, радзей роўная, цыліндрычная, крэмава-вохрыстая, гладкая, з карычнева-бурым сеткавым малюнкам. Малады Ж. г. вельмі падобны на баравіка (адрозніваецца ружаватым нізам шапкі, цёмнай сеткай на ножцы, горкім смакам).

Літ.: Гл. пры арт. *Грыбы*.

ЖОЎЦЕВЫЯ КІСЛОТЫ, высокамалекулярныя монакарбонавыя поліцыклічныя кіслоты з класа стэрынаў, вытворныя халапавай кіслаты. Утвараюцца ў клетках печані чалавека і многіх жывёльных арганізмаў і выдзяляюцца з *жоўцю*.

Да Ж. к. належаць холевая, дэзоксіхолевая, літахолевая і інш. к-ты. Асн. частка іх у жоўці злучаецца з гліказолам і таўрынам і ўтварае т. зв. парныя Ж. к. (напр., глікахолевыя к-ты), солі якіх садзейнічаюць эмульгаванню і ператварэнню тлушчаў, усмоктванню тлустых к-т. Ж. к., што атрымліваюць з жоўці вышэйшых жывёл, выкарыстоўваюцца ў фармацэўтычнай прамысловасці як каштоўная сыравіна для вытв. полавых гармонаў і інш.

Літ.: Фердман Д. Л. Биохимия, 3 изд., М., 1966.

ЖОЎЦЕКАМЯНЁВАЯ ХВАРОБА, хвароба жоўцевага пузыра і жоўцевых шляхоў, якая характарызуецца ўтварэннем камянёў рознага саставу (халестэрын, жоўцевыя пігменты, ванна) і будовы. Найчасцей хварэюць жанчыны ў 50—60 г. Бывае ад застою жоўці, запалення жоўцевага пузыра і жоўцевых шляхоў, парушэння халестэрынавага абмену.

Памеры камянёў — ад пясчынкі да ляснога арэха. Ускладненні Ж. х.: флегмона, гангрэна, вадзянка, эмпіема і перфарацыя жоўцевага пузыра, жоўцевы перытаніт, самаадвольны жоўцевы свішч. Лячэнне: у час прыступу грэлкі, ванны, болепатольныя, антыспазмалітычныя, процізапаленчыя сродкі, новакаінавая блакада; міжпрыступны перыяд — дыэта, жаўцягонныя сродкі, дуадэнальнае зандзіраванне, мінер. воды на курортах Трускавец, Моршын, Есентукі, Ждановічы (СССР), Карлавы Вары (ЧССР). Пры неэфектыўнасці лячэння і ўскладненнях — хірург. аперацыі. Прафілактыка: дыэта, рэжым харчавання і фіз. актыўнасці.

Літ.: Лидский А. Т. Хирургические заболевания печени и желчевыводящей системы, М., 1963; Виноградов В. В., Мазаев П. Н. и Гришкевич Э. В. Рентгеноманометрическое исследование желчных путей, Л., 1966; Авдей Л. В. Клиника и хирургическое лечение холецистита, Мн., 1963; Бобрик И. И. Желчные перитониты, «Здравоохранение Белоруссии», 1955, № 6.

Л. В. Аўдзей. Мінск.

ЖОЎЦЬ, сакрэт, які выпрацоўваецца пазіганальнымі клеткамі печані названочных жывёл і чалавека.

Вадкасць залаціста-жоўтага, карычневага ці зеленаватага колеру. У састаў ле ўваходзяць вада, *жоўцевыя кіслоты*, жоўцевыя пігменты (напр., *білірубін*), халестэрын, ліпіды, неарган. солі і інш. Збіраецца ў жоўцевым пузыры, адтуль праз пратоку выводзіцца ў дванаццаціперсную кішку. Гл. таксама *Печань*.

ЖРЭЦТВА, асобная грамадская група служак культу пераважна ў політэістычных рэлігіях. Шанавалася як пасрэднік паміж уяўным светам багоў, духаў і людзьмі. Адна з найважнейшых функцый Ж.— выкананне *ахвярапрынашэння*. Слова «жрэц» паходзіць ад старасл. «жраці» — прыносіць ахвяру.

З узнікненнем класавага грамадства Ж. вылучылася ў асобную прывілеяваную групу, стала часткай пануючага класа і ўсяляк падтрымлівала эксплуататарскі лад. У Ст. Егіпце, Вавілоніі, Іране і ў інш. краінах яно валодала багаццямі, зямлёю, рабамі, мела вялікую паліт. ўладу. Ж. канцэнтравала ў сваіх руках усе навук. веды таго часу, утойвала іх ад народа. Ж. не толькі падтрымлівала рэліг. міфы, але і стварала іх, ускладняла рэлігію. Знікла з паяўленнем монатэістычных рэлігій — хрысціянства, ісламу, ламаізму і інш. На змену яму склалася *духавенства*. На Беларусі Ж. існавала да 12—13 ст. Захавалася ў некат. народаў Афрыкі, Паўд. Амерыкі, Акіяніі.

ЖУДАЎ Іван Ягоравіч (ліст. 1921, с. Прычыж Соўскага пав. Бранскай губ.— 26.2.1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Магілёўскай вобл. 27.6.1944 узвод пад камандаваннем Ж. фарсіраваў Дняпро, на захопленым плацдарме адбіў 3 варожыя контратакі.

ЖУЖАЛІ (Carabidae), сямейства атр. жукоў. Вядома больш за 20 тыс. відаў, пашыраных пераважна ў краінах з умер. кліматам. У СССР 2300 відаў, на Беларусі каля 200.

Даўж. цела да 8 *см*. Плёнкавыя крылы ў некат. відаў адсутнічаюць ці недаразвітыя. Дарослыя жукі жывуць на глебе (лічынкі — у глебе), некат. на дрэвах. Большасць актыўныя ўначы. Многія Ж. роду Carabus, Calosoma, Cicindela, Bembidion і інш.— шкодзяць с.-г. раслінам. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Жукі* і літ. пры ім.

ЖУЖЛЯНКА, гарадзішча і паселішча за 15 *км* ад Асіповіч Магілёўскай вобл., у сутоцы Жужлянкі і Свіслачы. Даследавалі А. Рынейскі (1923), А. Немцаў (1925), С. С. Шутаў і М. М. Улашчык (1926), Л. Д. Побаль (1959), Э. М. Загарульскі (1963), Ю. І. Драгун (1963—64). Гарадзішча ўмацавана валамі і ровам, памер *(м)* 130×100. Пры раскопках знойдзены штрыхаваная, глянцаваная ляпная і ганчарная кераміка і жал. прылады працы. Гэтыя рэчы даюць падставу сцвярджаць, што гарадзішча ўзнікла ў зоне кантактаў плямёнаў, што жылі на тэр. Паўд. Беларусі (мілаградская і зарубінецкая культуры) і Цэнтр. Беларусі (культура штрыхаванай керамікі). На паселішчы выяўлены рэшткі наўзямлянак і ляпная кераміка 2—5 ст., 6—8 ст., 10—13 ст.


Літ.: Драгун Ю. И. Раннеславянское поселение в нижнем течении р. Свислочь, у кн.: Белорусские древности, Мн., 1967.

ЖУЙКОЎ Мікалай Пятровіч (снеж. 1922, пас. Ялаўскі Глазаўскага пав. Вяцкай губ.— 1.3.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. На фронце з 1943. Вызначыўся 1.3.1944 у баі за вышыню каля в. Мормаль Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. Лейтэнант Ж. сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота. Пасмяротна ўзнаг. ордэнам Леніна.

ЖУК Аляксандр Апанасавіч (н. 2.5.1918, в. Веска Слуцкага пав. Мінскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). Ген.-м. (1957). З сяліян. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Мінскае ваен. пяхотнае вучылішча (1937), Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1948). У Чырв. Арміі з 1934. У Айч. вайну з сак. 1942 на Зах., Данскім, 1-м і 2-м Бел. франтах — камандзір роты, нач. штаба і камандзір палка. Вызначыўся пры фарсіраванні Одэра і ў баях за плацдарм на зах. беразе ракі. Пасля вайны да 1959 на камандных пасадах. Жыве ў Маскве.



ЖУК Сяргей Якаўлевіч [22.3(4.4).1892, Кіеў — 1.3.1957], савецкі вучоны ў галіне гідратэхнікі. Акад. АН СССР (1953). Герой Сац. Працы (1952). Чл. КПСС з 1942. У 1917 скончыў Петраградскі ін-т інжынераў шляхоў зносін. З 1942 нач. і гал. інжынер Гідрапраекта Мін-ва электрастанцый СССР. Кіраваў праектаваннем і буд-вам гідратэхн. збудаванняў: канала імя Масквы, Волга-Данскога суднаходнага канала, Волга-Балтыйскага воднага шляху, Куйбышаўскай, Валгаградскай, Угліцкай, Рыбінскай ГЭС і інш. Дэп.



Вярх. Савета СССР 1-га і 4-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1950, 1951.

Літ.: Жук Сергей Яковлевич, «Вестник АН СССР», 1954, № 1, с. 49.

ЖУКАВА 2-е, гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры* і *штрыхаванай керамікі культуры* (2 ст. да н. э.—4 ст. н. э.) каля в. Жукава Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. Умацавана валам і ровам, памер (*м*) 70×45. Адкрыта ў 1873, даследавалася Л. В. Аляксеевым (1951) і В. Н. Кузняцовым (1955). Пры раскопках знойдзены жалезныя прабойнік і серп, гліняная прасліца, рэшткі ляпных гладкасценных і штрыхаваных пасудзін, зерняцёрка.


Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины, у кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики, М., 1959 (Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции, [т.] 1).

А. Р. Мітрафанаў. Мінск.

ЖУКАЎ Васіль Аляксеевіч (н. 17.9.1928, в. Рагінь Буда-Кашалёўскага р-на Бабруйскай акр.), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1956. Прац. дзейнасць пачаў у 1944 трактарыстам у саўгасе «Рагінь» Буда-Кашалёўскага р-на Гомельскай вобл. У 1953—57 механік, брыгадзір трактарнай брыгады Рагіньскай МТС. З 1957 механізатар саўгаса «Рагінь». Дэп. Вярх. Савета БССР 7-га скл.

ЖУКАЎ Васіль Пятровіч (1922, в. Бярозаўка Багародзіцкага пав. Тульскай губ.— 12.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся каля г. Масты Гродзенскай вобл. 12.7.1944 камандзір кулямётнага разліку Ж. адбіў 3 варожыя контратакі і кінуўся з гранатамі пад танк, каб выратаваць камандны пункт роты. Пахаваны ў Мастах.

ЖУКАЎ Георгій Канстанцінавіч [н. 19.11 (1.12).1896, в. Стралкоўка Малаяраславецкага пав. Калужскай губ.], савецкі ваенны дзеяч, Маршал Сав. Саюза (1943), чатыры разы Герой Сав. Саюза (1939, 1944, 1945, 1956), Герой МНР (1969). З сялян. Чл. КПСС з 1919. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў. У Чырв. Арміі з 1918. Скончыў Разанскія кав. курсы (1920), кав. курсы ўдасканалення камсаставу (1925), курсы ўдасканалення вышэйшага нач. саставу (1930). У 1938—39 нам. камандуючага Бел. ваен. акругі па кавалерыі. У 1939 камандуючы 1-й армейскай групы сав.-манг. войск у аперацыі супраць яп. захопнікаў на р. Халхін-Гол. У 1940 камандуючы Кіеўскай ваен. акругі. У лютым—ліп. 1941 нач. Ген. штаба і першы нам. наркома абароны; у Айч. вайну камандаваў Рэзервовым, Ленінгр., Зах., 1-м Укр., 1-м Бел. франтамі. Адзін з кіраўнікоў абароны Масквы і разгрому ням.-фаш. войск пад Масквой. З жн. 1942 і да канца вайны нам. Вярх. галоўнакамандуючага. Як прадстаўнік Стаўкі каардынаваў дзеянні франтоў у *Сталінградскай бітве 1942—43*, пры прарыве блакады Ленінграда, у *Курскай бітве 1943*, *Беларускай аперацыі 1944* і інш. Камандаваў 1-м Бел. фронтам пры ўзяцці Берліна (гл. *Берлінская аперацыя 1945*). Па даручэнні Сав. ўрада з прадстаўнікамі ЗША, Англіі і Францыі прыняў безагаворачную капітуляцыю фаш. Германіі (у поч на 9.5.1945). Пасля вайны на камандных пасадах у Сав. Арміі. У 1955—57 міністр абароны СССР. Чл. ЦК КПСС (1952—57), канд. у чл. Прэзідыума ЦК КПСС (1956—57), чл. Прэзідыума ЦК КПСС (чэрв.— кастр. 1957). Дэп. Вярх. Савета СССР 1—4-га скл. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэв., 2 ордэнамі «Перамога», многімі інш. ордэнамі і медалямі СССР і замежных дзяржаў.



Тв.: Воспоминания и размышления, М., 1969.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—1945, т. 1—5, М., 1960—1963.

ЖУКАЎ Мікалай Мікалаевіч [н. 19.11(2.12). 1908, Масква], рускі савецкі графік. Нар. мастак СССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (з 1948). Чл. КПСС з 1945. Вучыўся ў маст.-прамысл. тэхнікуме ў Ніжнім Ноўгарадзе (1926—28) і Саратаўскім маст. вучылішчы (1928—30). Маст. кіраўнік Студыі ваенных мастакоў імя Грэкава (з 1943). Майстар станковага малюнка і ілюстрацыі. Творы: серыі малюнкаў, прысвечаных К. Марксу і Ф. Энгельсу (пач. ў 1938), У. І. Леніну (пач. ў 1940), серыя «Пра дзяцей» (1943—68), «Нюрнбергскі працэс» (1946), «Па Чахаславакіі» (1955—59), «Па Італіі» (1956—68); франтавыя малюнкі і плакаты (1941—45); іл. да «Аповесці пра сапраўднага чалавека» Б. Палявога (1950—54), кн. «Рэпартаж з пятлёй на шыі» Ю. Фучыка (1964) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1943, 1951. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Зоркі і медалямі.

Літ.: Толстой В., Н. Н. Жуков, М., 1952; Никулина О. Р., Н. Н. Жуков, М., 1960.

ЖУКАЎ Пётр Сяргеевіч (22.1.1921, в. Мікулічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ.— 22.12. 1967), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Член КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1940. У Айч. вайну на Паўд.-Зах., Паўн.-Каўказскім, Паўд., Цэнтр., 1-м Бел. франтах — камандзір батальёна. Удзельнік вызвалення Новарасійска, Тамані, Керчы. Вызначыўся ў чэрв. 1944 у час прарыву варожай абароны на рубяжы рэк Трэмля і Пціч, пры вызваленні вёсак на Пд ад Бабруйска.



ЖУКАЎ Прохар Іванавіч [н. 4(17).1.1915, в. Альшова 1-е Рослаўскага пав. Смаленскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне іхтыялогіі. Д-р біял. н. (1968), праф (1969). Чл. КПСС з 1944. Удзельнік Айч. вайны (1941—45). Скончыў Усесаюзны зоатэхнічны ін-т пушнасыравіннай гаспадаркі (1937). Працаваў у аддзеле заалогіі і паразіталогіі АН БССР (1951—67). З 1967 дырэктар Бел. НДІ рыбнай гаспадаркі. Асн. працы па іхтыялогіі, рыбнай гасп., ахове прыроды Беларусі. Даследуе іхтыяфаўну Беларусі, вывучае пытанні яе фарміравання і біял. асновы арганізацыі азёрна-рачнога рыбалоўства.

Тв.: Рыбы Белоруссии, Мн., 1965; Биологические основы рыболовства, Мн., 1968; Ленинские принципы охраны природы, у кн.: Охрана природы, Мн., 1969.

ЖУКАЎ Сцяпан Іванавіч (н. 1.5.1923, в. Пушча Полацкага пав.), Герой Сав. Саюза (1946). З сялян. Член КПСС з 1950. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1941), Чарнігаўскую ваен. школу пілотаў (1943). У Айч. вайну на Цэнтр. і 1-м Бел. франтах — ст. лейтэнант, нам. камандзіра авіяэскадрыллі. Удзельнік вызвалення Сеўска, Нежына, Канатопа, Чарнігава, Беларусі, баёў у Германіі. Зрабіў 170 баявых вылетаў, у т. л. ў час вызвалення Беларусі 50 разоў вылятаў на чале групы і 30 разоў — на разведку. Жыве ў Расонах Віцебскай вобл.



ЖУКАЎ Яўген Міхайлавіч [н. 10(23).10.1907, Варшава], савецкі гісторык, акад. АН СССР (1958; чл.-кар. 1946). Чл. КПСС з 1941. З 1929 на пед. рабоце ў Ленінградскіх усх. ін-це і ун-це. У 1943—50 дырэктар Ціхаакіянскага ін-та АН СССР. З 1946 заг. кафедры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС, у 1957—71 акад.-сакратар Аддзялення гісторыі АН СССР, з 1968 дырэктар Ін-та ўсеагульнай гісторыі АН СССР. Распрацаваў шэраг асн. пытанняў гісторыі Японіі, асабліва новага і павейшага часу. Аўтар прац па міжнар. адносінах павейшага часу і калан. праблемах, па праблемах перыядызацыі гісторыі і яе агульных метадалагічных пытаннях. Гал. рэдактар «Сусветнай гісторыі» (1955—65) і Савецкай гістарычнай энцыклапедыі (з 1958). Чл. Сав. к-та абароны міру (з 1955) і Сав. к-та салідарнасці краін Азіі і Афрыкі (з 1958). Узнаг. 3 ордэнамі Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.



Тв.: Япония 1940—1950 годов, М., 1951; Япония в период второй мировой войны.— Борьба японского народа за независимость после войны, М., 1954; Очерки новейшей истории Японии, М., 1957 (у сааўт.).

ЖУКЕВІЧЫ, вёска ў Капцёўскім с/с Гродзенскага р-на. Цэнтр калгаса «Камсамолец». За 9 *км* на Пд ад Гродна. 167 ж., гасп. 47 (1971). Васьмігадовая школа, вет. пункт.

ЖУКІ, цвердакрылыя (Coleoptera), атрад насякомых. Вядома да 300 тыс. відаў, пашыраных па ўсім свеце, акрамя арктычных шырот і Антарктыкі. У СССР больш за 20 тыс. відаў. Паводле спосабу жыўлення падзяляюцца на фітафагаў (расліннаедныя), сапрафагаў (жывяцца арган. рэшткамі) і драпежных. Сярод Ж. ёсць шкоднікі сельскай і лясной гасп., рыбаводства, харч. прадуктаў, драўляных будынкаў (*даўганосікі*, *лістаеды*, хлебныя Ж., *караеды*, златкі, дрывасекі). Некат. Ж. (гнаевікі, чарнацелкі) прамежкавыя гаспадары ўзбуджальнікаў гліснych хвароб чалавека і жывёл, пераносчыкі ўзбуджальнікаў страўнікава-кішачных хвароб. Вялікая карысная роля Ж.: энтамафагі (*божыя кароўкі*, *жужалі*, асабліва Calosoma) знішчаюць шкодных насякомых; санітары (гнаевікі, мертваеды) жывяцца трупамі, спрыяюць мінералізацыі арган. рэшткаў і абагачэнню глебы; многія садзейнічаюць перакрыжаванаму апыленню раслін.

Даўж. цела ад 0,5 *мм* (сям. перыстакрылых Ptiliidae) да 150 *мм* (сям. пласцінавусых Scarabaeidae). Ротавы апарат грызучы. Пярэднія крылы (надкрыллі) моцна хіцінізаваныя, укрываюць заднія крылы і цела, заднія — перапончатыя, служаць для лёту. Лічынкі з хіцінізаванай галавою і грызучым ротавым апаратам, ногі развітыя або адсутнічаюць. Ж. раздзельнаполыя, адкладваюць яйцы, рэдка жывародныя (некат. кароткакрылыя і лістаеды). Развіццё пераважна з поўным ператварэннем (яйцо, лічынка, кукалка, імага). Імага жывуць 1—6 месяцаў, тыл, што зімуюць,— да 1 года. Лічынкі, якія жывуць у глебе і драўніне, развіваюцца каля 1 года і больш (драцянікі 4—5 гадоў), тыл, што жывуць у сцяблах раслін, памёце і трупах,— 1—4 месяцы, фаза кукалкі — ад некалькіх дзён да 1 месяца. Ва ўмераных шыротах бывае 1 пакаленне за год, радзей больш (некат. божыя кароўкі, лістаеды). Іл. гл. на ўклейцы.

Літ.: Якобсон Г. Г. Жуки России и Западной Европы, в. 1—11, СПб., 1905—15; Определитель насекомых Европейской части СССР, т. 2, М.— Л., 1965; Справочник по защите сельскохозяйственных растений от вредителей и болезней, Мн., 1969.

Н. М. Гарбунова. Мінск.

ЖУКІ-ДРЫВАСЕКІ, тое, што *вусачы*.

ЖУКІПЕВА, вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Валадарскага. За 25 *км* па У ад Талачына, 112 *км* ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Коханава, 212 ж., гасп. 70 (1971). Лесапільня, млын. Сярэдняя школа, клуб, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 18 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ЖУКОВІЧ Платон Мікалаевіч (26.9.1857, г. Пружаны Гродзенскай губ.— 30.11.1919), беларускі бурж. гісторык, чл.-кар. Петраградскай АН (1918). Праф. (1894). З сям'і святшчэнніка. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1881). Выкладаў у Полацкім духоўным вуч., у Вільні, з 1891 у Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Аўтар прац «Сеймавая барацьба праваслаўнага заходнерускага дваранства з царкоўнай уніяй» (1901—12, в. 1—6) і артыкулаў па гісторыі Беларусі 2-й пал. 18 ст.

Тв.: Управление и суд в Западной Росии в царствование Екатерины II, «Журнал Министерства народного просвещения», 1914, № 2—5, 7; Сословно-

ный состав населения Западной России в царствование Екатерины II, там жа, 1915, № 1—2, 5; Западная Россия в царствование императора Павла, там жа, 1916, № 6, 8, 10.

Літ.: История исторической науки в СССР. Дооктябрьский период. Библиография, М., 1965.

М. І. Камінскі. Мінск.

ЖУКОЎСКІ, вёска ў Падольскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Гімбіцкага. За 45 *км* на ПнУ ад Астраўца, 295 *км* ад Гродна, 50 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 189 ж., гасп. 71 (1971). Павільён быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Абеліск першаму старшыні сельсавета К. А. Гімбіцкаму, закатаванаму пям.-фаш. захопнікамі.



ЖУКОЎСКІ Васіль Андрэевіч [29.1(9.2).1783, с. Мішанскае Бялёўскага пав. Арлоўскай правінцыі — 12(24).4.1852], рускі паэт, адзін з заснавальнікаў рус. рамантызму. Выхавальнік пры царскім двары (1826—41). Бараніў ад урадавай рэакцыі А. Пушкіна, А. Герцэна, М. Лермантава, дзекабрыстаў, спрыяў выкупу з прыгоннай няволі Т. Шаўчэнкі. Удзельнік гуртка *«Арзамас»*. Выступіў у л-ры як паэт-сентыменталіст. Аўтар рамант. балад «Людміла» (1808), «Касандра» (1809), «Святлана» (1813), «Вадзім» (1817), «Іванаў вечар» (1824) і інш., оды «Пясняр у стане рускіх воінаў» (1812). Паэзіі Ж. ўласцівыя інтанацыйна-рытмічнае багацце, эмац. выразнасць, музычнасць. Кансерват.-дваранская абмежаванасць светапогляду Ж. абумовіла пэўную псіхал. і ідэйную адцягненасць яго твораў. Перакладаў Гамера, Фірдаўсі, Ф. Шылера, Дж. Байрана, інд. эпас «Махабхарата». Аўтар вершаваных апрацовак нар. казак.

Тв.: Собр. соч., т. 1—4, М.— Л., 1959—60.

ЖУКОЎСКІ Мікалай Ягоравіч [5(17).1.1847, с. Арэхава Маскоўскай губ. (з 1917 г. Арэхава-Зуева) — 17.3.1921], рускі вучоны, заснавальнік сучаснай гідра- і аэрамеханікі. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1894). Праф. Маск. ун-та і Маск. вышэйшага тэхн. вуч. Працы Ж. па аэрадынаміцы з'явіліся крыніцай асноўных ідэй, на якіх развіваецца сучасная авіяц. навука. Усебакова даследаваў дынаміку лёту птушак і тэарэтычна прадказаў шэраг магчымых крывалінейных траекторый лёту (напр., «мёртвую пятлю», якую выканаў рус. лётчык П. М. Несцераў у жн. 1913). У 1898 стварыў тэорыю т. зв. гідраўлічнага ўдару. Адкрыў закон (1904, апублікаваў 1906), які вызначае велічыню падымальнай сілы крыла самалёта (тэарэма Жукоўскага). У 1912—18 распрацаваў віхравую тэорыю паветр. вінта; вызначыў найб. выгадныя профілі крылаў і лопасцей вінта самалёта. Вёў даследаванні па гідраўліцы, гідрадынаміцы, механіцы нязменных сістэм, тэарэт. астраноміі (тэорыя каметных хвастоў, метад вызначэння элементаў планетных арбіт), матэматыцы (ураўненні з частковымі вытворнымі, прыбліжанае інтэграванне). Па ініцыятыве Ж. ў 1918 створаны Цэнтр. аэрагідрадынамічны ін-т (ЦАГІ).



С. Ю. Жукоўскі. Інтэр'ер. 1916. Дзярж. маст. музей БССР.


Тв.: Собр. соч., т. 1—7, М.— Л., 1948—50.

Літ.: Домбровская Е. А. Николай Егорович Жуковский, М.— Л., 1939; Христианович С. А. Научное наследие Н. Е. Жуковского, М., 1951; Н. Е. Жуковский — библиография печатных трудов, М., 1968.

ЖУКОЎСКІ Станіслаў Юльянавіч [1(13).5.1873, фальварак Ендрыхоўцы Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ.— жн. 1944], рускі жывапісец. Акад. жывапісу (з 1907). Вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (1892—1901) у В. Сярова і І. Левітана. Чл. Т-ва перасоўных выставак (з 1904) і Саюза рускіх мастакоў (з 1907). Пісаў пейзажы, інтэр'еры, нацюрморты. Творы: «Нёман» (1896), «Веснавая вада» (1898), «Асенні



Жукі I. 1. Бронзаўка залацістая (Cetonia aurata). 2—3. Хрушчык палявы (Anomala dubia). 4. Гнаявік звычайны (Geotrupes stercorarius). 5. Хрушч пасяўны (Anisoplia segetum). 6. Хрушч мармуровы (Polyphylla fullo). 7. Жужаль валасісты (Ophonus rufipes). 8. Красацел залацісты (Calosoma auropunctatum). 9. Жужаль залацістаблямаваны (Carabus nitens). 10. Хрушчык садовы (Phyllopertha horticola). 11. Вадалюб вялікі чорны (Hydrous piceus). 12—13. Плывунец шырокі (Dytiscus latissimus). Самка (12) і самец (13). 14. Хрушч майскі заходні (Melolontha melolontha). 15. Шчаўкун бліскучы (Selatosomus aeneus). 16. Шчаўкун паласаты (Agriotes lineatus). 17. Шчаўкун пасяўны (Agriotes sputator). 18. Шчаўкун цёмны (Agriotes obscurus). 19. Шчаўкун чорны (Athous niger). 20. Шчаўкун чырвоны (Elater sanquineus). 21—22. Жукалень (Lucanus cervus). Самка (21) і самец (22).



Жукі I.

вечар» (1905), «Радасны май» (1912) і інш. У 20-я г. пераехаў у Польшчу, працаваў у Варшаве. У Дзярж. маст. музеі БССР 39 карцін Ж., у т. л. «Возера Сенеж» (1902), «Старая сядзіба» (1910), «Інтэр'ер» (1916) і інш.

Літ.: Хвойник И. и Крайтор И. Академик живописи С. Жуковский. К выставке работ, М., 1921.

ЖУКОЎСКІ Ян Алаіз Восіпавіч (псеўд. Каса; 1832 — г. см. невяд.), удзельнік паўстання 1863—64 на Беларусі і ў Польшчы. Скончыў Пецярбургскі кадэцкі корпус (1853), служыў у арміі, паручнік. З крас. 1863 паўстанцкі ваен. нач. Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ. Сфарміраваў атрад і пасля няўдалай спробы захапіць артылерыю ў Крычаве з рэшткамі атрада далучыўся да атрада Л. *Звяждоўскага* ў Горацкім пав. Пазней удзельнічаў у паўстанні на тэр. Польшчы. Пасля разгрому паўстання ў эміграцыі.

Літ.: Дьяков В. А. Герцен, Огарев и Комитет русских офицеров в Польше, у кн.: Революционная ситуация в России в 1859—1861 гг., М., 1963; Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы).

Г. В. Кіслаў. Вільнюс.

ЖУКОЎШЧЫНА, вёска ў Стрэльскім с/с Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «1 Мая». За 7 *км* на Пн ад Дзятлава, 133 *км* ад Гродна, 20 *км* ад чыг. ст. Навагрудак, каля шашы Слонім — Ліда (2 *км*). 175 ж., дамоў 40 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін.

ЖУКОЎШЧЫНА, вёска ў Станіслававуўскім с/с Шаркоўшчынскага р-на Віцебскай вобл., на правым беразе Дзісны. Цэнтр калгаса «Іскра». За 25 *км* на ПдЗ ад Шаркоўшчыны, 222 *км* ад Віцебска, 5 *км* ад чыг. ст. Полава; на шашы, якая злучае вёску з Шаркоўшчынай. 121 ж., гасп. 40 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, амбулаторыя, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік 72 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЖУЛАН (Lanius cristatus), птушка сям. сапракушавых атр. вераб'іных. Пашыраны ў Еўропе, Азіі. На Беларусі жыве ўсюды.



Даўж. цела Ж. 180—203 *мм*, маса каля 30 *г*. Галава і шыя шэрыя, спіна рыжавата - каштанавая, брушка з ружавата-попельным налётам, каля вачэй чорная папярочная палоска. Хвост доўгі, ступеньчаты. Жыве на ўзлесках, у хмызняках, каля дарог. Гнёзды робіць на дрэвах ці кустах. Нясе 6 яец. Корміцца насякомымі — шкоднікамі сельскай гаспадаркі.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ЖУПІН Сяргей Георгіевіч [н. 18(31).8.1906, с. Мядзведзіцкае Кашынскага пав. Цвярской губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сяліян. Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1928. У Айч. вайну на Зах. фронце абараняў Беласток, Гродна, Ваўкавыск, Слонім. З ліп. 1941 у партызанах: арганізатар атрадаў у Кругляпскім і Шклоўскім р-нах, камандзір атрада № 36; з канца 1942 камандзір *партызанскай брыгады 8-й Круглянскай.* Удзельнічаў у арг-цыі і ажыццяўленні аперацыі па разгроме варожага гарнізона на чыг. ст. Слаўнае. У 1944—50 на сав. рабоце ў Брэсце і ў Мінску. Жыве ў Мінску.




Літ.: Люди легенд, в. 2, М., 1966, с. 100—110.

ЖУПІНА Лариса Аляксандраўна [н. 12(25).7.1914, г. Мсціслаў Магілёўскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне фіз. хіміі і тэхналогіі шкла. Д-р тэхн. н. (1968), праф. (1970). Скончыла Бел. політэхн. ін-т (1938). З 1946 на кафедры тэхналогіі сілікатаў гэтага ін-та. Навук. працы па даследаванні механізмаў утварэння сілікатных матэрыялаў і распрацоўцы новых відаў шкла (сіталаў) са спец. ўласцівасцямі.

Тв.: У кн.— Синтез стекол и силикатных материалов, Мн., 1963; Стеклообразное состояние, в. 1, М.— Л., 1963; Стекло, ситаллы и силикатные материалы, в. 1, Мн., 1970.

ЖУПА, тэрытарыяльнае аб'яднанне родаў, пазней суседніх абшчын у паўд. і зах. славян у раннім сярэдневякоўі. Вышэйшы орган — нар. сход. На чале Ж. стаяў жупан, які выбіраўся і са старэйшынамі родаў вырашаў адм. і судовыя справы, а ў час вайны ўзначальваў ваен. сілы. Пасля распаду родаў улада жупана стала наследнай, а жупаны — феад. знаццю. Пазней Ж.— адм. адзінка.



Жукі II. 1. Свідравальшчык карабельны (Lymexylon navale). 2. Свідравальшчык лісцевы (Elateroides dermestoides). 3. Скураед музейны (Anthrenus museorum). 4. Златка пнёвая хваёвая (Buprestis mariana). 5. Дрэвагрыз баразнаваты (Lyctus linearis). 6. Тачыльшчык мэблевы (Anobium domesticum). 7. Прытворшчык-злодзей (Ptinus fur). 8. Тачыльшчык дамавы (Coelostethus pertinax). 9. Скураед вяндлінны (Dermestes lardarius). 10. Тачыльшчык хлебны (Stegobium paniceum). 11—12. Святляк (Lampyris noctiluca). Самец (11) і самка (12). 13. Майка сіняя (Meloe violaceus). 14. Маруднік пясчаны (Opatrum sabulosum). 15. Кароўка сямікрапінкавая (Coccinella septempunctata). 16. Рагій рабрысты (Rhagium inquisitor). 17. Вусач шэры дамавы (Hylotrupes bajulus). 18. П'явіца чырванагрудая (Lema melanopus). 19. Шчытаноска бураковая (Cassida nebulosa). 20. Вусач шэры даўгавусы (Acanthocinus aedilis). 21. Блошка крыжакветная сіняя (Phyllotreta nigripes). 22. Блошка льняная сіняя (Aphthona euphorbiae). 23. Блошка хлебная паласатая (Phyllotreta vittula). 24. Гарохавая зярноўка (Bruchus pisorum). 25. Семяед канюшынны (Apion apricans). 26. Каларадскі жук (Leptinotarsa decemlineata). 27. Паласаты клубеньчыкавы даўганосік (Sitona lineatus). 28. Лубінавы даўганосік (Sitona griseus).



ЖУПА́Н (шарак), старадаўняе верхняе мужчынскае і жаночае адзенне ў палякаў, беларусаў і ўкраінцаў. У 16—19 ст. быў часткай адзення шляхты, мяшчан і ўкраінскага казацтва.

Шылі з сукна, пераважна сіняга і шэрага колеру. Крой прамы, двухбортны, спінка прыталеная, з бакоў устаўляліся прызборапыя клíны. Пярэднія гладкія полкі зашпільваліся збоку на 2 гузікі. Вялікі адкладны каўнер і закаўрашы часта шылі з чырвонага атласу, аксаміту ці футра.

ЖУПА́НЧЫЧ (Župančić) Отан (23.1.1878, в. Вініца, Славенія — 11.6.1949), славенскі паэт. Скончыў Венскі ун-т. Працаваў дырэктарам Люблянскага т-ра. У 2-ю сусв. вайну супрацоўнічаў у партыз. друку. Вітаў Сав. Армію, якая вызваліла Югаславію ад нямф.-фаш. захопнікаў. Аўтар зб. вершаў «Келіх ап'янення» (1899), «Цераз поле» (1904), «Маналогі» (1908), «На волку Відова дня» (1920), «Барвенак пад снегам» (1945). Творчасці Ж., не пазбаўленай у ранніх вершах уплыву еўрап. дэкадансу, уласцівыя сувязь з фальклорам, дэмакратызм, пафас нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Дзень паэзіі, Мн., 1966; тое ж, Мн., 1971; рус. пер.— Пробуждение, М., 1961.

ЖУПРА́НЫ, вёска ў Ашмянскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Ашмянка. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Багушэвіча. За 10 *км* на ПнУ ад Ашмян, 240 *км* ад Гродна, 7 *км* ад чыг. ст. Ашмяны, на шашы Вільнюс — Мінск. 423 ж., двароў 121 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Вёска вядома з 15 ст. Помнік 11 сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну, помнік на магіле бел. пісьменніка Ф. Багушэвіча.


ЖУР (аўсяны кісель), старадаўняя беларуская страва. З аўсянага вотруб'я робяць рэдкае цеста (цэд) на вадзе, суткі квасяць, потым працэджваюць, соляць і вараць. Згатаваны Ж. разліваюць у талеркі і ставяць у холад, каб застыў. Ядуць з сытою, алеем, смажаным салам.

ЖУРАВЕ́ЛЬ, познамезалітычная стаянка каля в. Журавель Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. Адкрыта і даследавалася К. М. Палікарповічам (з 1934). Пры раскопках знойдзены грубаапрацаваныя сякеры, цёслы, разцы, пікападобныя прылады працы, скрабкі. Большасць рэчаў зроблена з вял. адшчэпаў. Палікарповіч адносіў Ж. да раняга неаліту (6—4-е тысячагоддзі да н. э.), археолаг У. П. Левянок — да мезаліту.

Літ.: Поликарпович К. М. Стоянки Среднего Посожья, у кн.: Материалы по археологии БССР, т. 1, Мн., 1957. *У. Ф. Ісаенка.* Мінск.

ЖУРАВІ́НЫ (Oxycoccus), род вечнаазялёных раслін сям. бруснічных. Вядома 4 віды, пашыраныя ва ўмеранай зоне Паўн. паўшар'я. У СССР і на Беларусі два: Ж. балотныя (O. quadripetalus) і Ж. драбнаплодныя (O. microcarpa). Выкарыстоўваюцца Ж. ў харч. прамысловасці і як лекавы сродак. У некат. краінах (ЗША) Ж. культывуюцца, выведзена больш за 200 сартоў.

Кусцікі Ж. сцелюцца, з тонкімі галінкамі, даўж. 10—80 *см*. Лісце дробнае, скурастае, прадаўгавата-акругленае. Кветкі паніклыя, па 2—4 у парасонападобных суквецціях. Плод — цёмна-чырвоная кіслая ягада з сакаўной мякаццю. Растуць на сфагнавых вярховых і пераходных балотах. У Ж. ёсць лімонная і бензойная к-ты, цукры, вітамін С.



Журавіны балотныя: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка.

Літ.: Шапиро Д. К., Михайловская В. А. и Манциводо Н. И. Дикорастущие плоды и ягоды, Мн., 1969.

ЖУРА́ВІЧЫ (да 1956 цэнтр Журавіцкага р-на), вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Гутлянка. Цэнтр сельсавета і калгаса «12 гадоў Кастрычніка». За 47 *км* на ПнУ ад Рагачова, 102 *км* ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з шашой Слаўгарад — в. Доўск. 1417 ж., двароў 464 (1971). Ільнозавод, млын, нафтабаза, пякарня, мех. майстэрні, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, аптэка, дзіцячыя яслі і сад, аддз. сувязі, сталовая, 7 магазінаў. Помнік У. І. Леніну. Вёску двойчы (1941, 1943) часткова спалілі нямф.-фаш. захопнікі, у ліст. 1941 загубілі 115 сав. грамадзян. Помнік 133 землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЖУРА́Ў Анатоль Яфімавіч (п. 24.2.1922, Гомель), беларускі савецкі гісторык. Д-р гістар. н. (1967), праф. (1968). З рабочых. Чл. КПСС з 1943. Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1946), Гомельскі пед. ін-т (1947). Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1946 сакратар Гомельскага абкома камсамола, з 1948 заг. кафедры марксізма-ленінізма ў Аршанскім пастаўпікім ін-це, з 1955 дацэнт Мінскага пед. ін-та, з 1960 заг. кафедры марксізма-ленінізма Бел. тэатр.-маст. ін-та. З 1967 у БДУ. Аўтар прац па гісторыі камсамола Беларусі. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі (1970). Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Камсамол Беларусі ў барацьбе за сацыялізм (1918—1941), Мн., 1957; Як быў створан камсамол Беларусі, Мн., 1958; Ленін — моладзі, Мн., 1969; У баях народжаны. Кароткі нарыс гісторыі камсамола Беларусі, 2 выд., Мн., 1970; Под руководством партии. Деятельность КПБ по созданию и руководству комсомолом Белоруссии. 1917—1925 гг., Мн., 1970.

ЖУРА́Ў Віталь Мікалаевіч (п. 8.5.1920, в. Пралетарская Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.), наватар вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1945. Удзельнік Айч. вайны. Працоўную дзейнасць пачаў у 1937 слесарам паравознага дэпо станцыі Віцебск. З 1956 дарожны майстар, з 1964 начальнік механізаванага ўчастка, з 1970 старшыня прафсаюзнага к-та Віцебскай дыстанцыі пуці Бел. чыгункі. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

ЖУРАЎЛЁЎ Анатоль Георгіевіч (н. 1.5.1922, в. Вялікае Макарава Асташкаўскага пав. Цвярской губ.), гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1954. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Гродзенскі пед. ін-т (1953). У 1955—59 дырэктар Радунскай МТС, у 1959—61 дырэктар саўгаса «Жырмуны» Радунскага р-на Гродзенскай вобл. З 1961 дырэктар саўгаса «Пагародна» Воранаўскага р-на Гродзенскай вобл.

ЖУРАЎЛЁЎСКАЕ, балота пераважна нізіннага тыпу ў Докшыцкім і Глыбоцкім р-нах Віцебскай вобл. Утварылася ад затарфоўвання азёрна-ледавіковай катлавіны на паўд.-ўсх. схіле Свянцянскіх градаў. Большую ч. (60—70%) паверхні балота займае лес (хвоя, бяроза, вольха). Торф на 85% нізіннага тыпу, 13 вярховага, 2% мяшанага. Жыўленне пераважна грунтавымі водамі. Пл. балота 18,2 тыс. *га*, прамысл. пакладу торфу на 14,2 тыс. *га*. Макс. таўшчыня тарфянога пласта 6 *м*, сярэдняя 2 *м*, запасы 48,1 млн. *т*. Торф падсцілаецца сапрапелем і мергелем таўшчынёй да 3,6 *м*.

ЖУРАЎЛІ, жураўлепадобныя (Grues Gruiformes), атрад птушак. 18 відаў, аб'яднаных у 3 сям.: уласна Ж. (14 відаў), трубачы (3 віды) і арамы (1 від). Пашыраны па ўсёй зямлі (апрача Арктыкі і Антарктыкі). У СССР 7 відаў, на Беларусі *шэры журавель*.

Выш. Ж. каля 2 *м*, маса 2—15 *кг*. Ногі і шыя адносна доўгія, дзюба пераважна доўгая і вострая. Апярэнне (за выключэннем трапічных відаў) шчыльнае, шэрае з чорным, буравата-шэрае ці буравата-чорнае. Ж., пашыраныя ў фаўне СССР, жывуць на лясных балотах і сырых лугах, у стэпах, лесатундры і хмызняковай тундры. Наземныя, часткова драўныя птушкі. Кормяцца пераважна расліпамі. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Птушкі*.

Літ.: Жизнь животных, т. 5, М., 1970.

ЖУРАЎНА, возера ў бас. р. Начы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,53 *км*². Даўж. 1,5 *км*, найб. шыр. 0,7 *км*, сярэдняя 0,3 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Вадазбор (7,8 *км*²) узгорыста-марэнны. Водзяцца лешч, плотка, акунь, шчупак, лінь, джгір.

ЖУРАЎСКІ Аркадзь Іосіфавіч (п. 5.8.1924, в. Япава Аршанскага пав. Віцебскай губ.), беларускі савецкі мовазнавец. Д-р філал. н. (1968), праф. (1970). Чл. КПСС з 1962. З сялян. У 1942—44 у партызанах. Скончыў БДУ (1950). З 1953 навук. супрацоўнік, з 1960 заг. сектара гісторыі бел. мовы Ін-та мовазнаўства АН БССР. Даследчык гісторыі бел. мовы. Сааўтар прац «Нарысы па гісторыі беларускай мовы» (1957), «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія» (1957), «Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы» (ч. 1—2, 1961—62), «Пісьменнік і мова. Хрэстаматыя» (1962), «Гістарычная лексікалогія беларускай мовы» (1970).

Тв.: Гісторыя беларускай літаратурнай мовы, т. 1, Мн., 1967.

ЖУРАЎСКІ Дзмітрый Пятровіч [1810, Магілёўская губ.— 11(23).11.1856], статыстык. З дробных дваран. Скончыў Пецярбургскі кадэцкі корпус (1829). З 1831 працаваў у камісіі М. М. Спяранскага па складанні збору законаў Рас. імперыі. З 1845 у Кіеве на стат. рабоце. Заснавальнік крытычнага метаду ў статыстыцы. Стварыў сістэму стат. паказальнікаў і метадаў вывучэння з'яў грамадства і прыроды, склаў праграму вывучэння прадукцыйных сіл Расіі. Аўтар стат. даследаванняў, якія выкрывалі прыгонны лад і аб'ектыўна садзейнічалі яго звяржэнню.

Тв.: Об источниках и употреблении статистических сведений, М., 1946.

Літ.: Птуха М. В., Д. П. Журавский, жизнь, труды, статистическая деятельность, М., 1951.

ЖУРБА́ Янка [сапр. Івашын Іван Якаўлевіч; 18(30).4.1881, в. Куцініна Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 7.1.1964], беларускі савецкі паэт. З сялян. Скончыў Глухаўскі настаўніцкі ін-т (1909). Настаўнічаў па Украіне і Беларусі. Працаваў у навук.-пед. камісіі Нар. камісарыята асветы БССР (1921—22), інспектарам сац. выхавання пры Бабруйскім акр. аддзеле пар. асветы (1923—26), настаўнікам (1926—34). Друкаваўся на рус. мове з 1902. Першы верш на бел. мове «На беразе Дзвіны» (1909) змясціў у газ. «Наша ніва». Тэматыка дарэвалюц. вершаў — абмалёўка падняволь-нага лёсу прац. сялянства, вера ў лепшую будучыню свайго народа, апяванне харства Беларусі. У зб. «Заранкі» (1924), «Ясныя шляхі» (1959) услаўляе заваёвы рэвалюцыі, дружбу сав. народаў, мірную стваральную працу. Лірызм і задушэўнасць, народна-песенныя матывы — у найлепшых пейзажных і інтымных вершах («Залацісты вечар дагарае», «Не забыць мне дзён маёвых», «У ясны дзень», «Не трысцё шапоча казку»). Паасобныя творы паэта залішне рацыяналістычныя, пазбаўленыя арыгінальных выяўленчых сродкаў. Для дзяцей напісаў кн. «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955), «Светлыя дні» (1959).



Тв.: Выбраныя творы, Мн., 1950; Ластаўкі, Мн., 1966; Вершы, Мн., 1970; Аўтабіяграфія, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966. *В. П. Рагойша.* Мінск.

ЖУРБІН, чыг. ст. на лініі Крычаў — Унеча (РСФСР), вёска ў Сялецкім с/с Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. За 30 *км* на ПдУ ад Касцюковіч, 190 *км* ад Магілёва. 474 ж., гасп. 140 (1971). Клуб, б-ка, магазін.

ЖУРКОЎ Серафім Мікалаевіч [н. 3(16).5.1905, с. Трубеччына Тамбоўскай губ.], савецкі фізік. Акад. АН СССР (1968, чл.-кар. 1958). Чл. КПСС з 1944. У 1929 скончыў Варонежскі ун-т. З 1930 працуе ў Фізіка-тэхн. ін-це АН



СССР. Аўтар прац па высвятленні фіз. прыроды мех. уласцівасцей цвёрдых целаў. Прапанаваў малекулярны механізм зацвердзявання (размякчэння) аморфных і палімерных рэчываў. Даследуючы механізм разбурэння цвёрдых целаў (металы, палімеры, шкло, іонныя злучэнні), паказаў, што ім уласціва часавая залежнасць трываласці. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Літ.: Константинов Б. П. Серафим Николаевич Журков, «Успехи физических наук», 1965, т. 87, в. 2 (спіс прац Ж.).

«ЖУРНАЛ ПРИКЛАДНОЙ СПЕКТРОСКОПИИ», усесаюзны штомесячны навуковы часопіс, які выдаецца АН БССР. Выходзіць у Мінску з 1964 па рус. мове. Асн. навук. кірункі — фіз. асновы і метады атамнага і малекулярнага спектральнага аналізу, спектральная апаратура і метады вымярэнняў, аптычныя квантавыя генератары і нелінейная оптыка, спектраскапія рассейвальнага асяроддзя, спектраскапія плазмы і інш. Гал. рэдактар акад. АН БССР Б. І. Сцяпанаў (з 1964).

А. А. Нікіціна. Мінск.

ЖУРНАЛІСТЫКА, адна з формаў літаратурнай дзейнасці, прафесія журналістаў; навука пра ролю друку, радыё і тэлебачання ў грамадстве, пра формы і метады журналісцкай дзейнасці. У руках імперыял. буржуазіі Ж. стала сродкам распаўсюджвання рэакц. ідэалогіі, падману і дэзінфармацыі працоўных. Бурж. ідэолагі выхваляюцца т. зв. «свабодай друку». «Капіталісты называюць свабодай друку свабоду подкупу друку багатымі, свабоду выкарыстоўваць багацце для фабрыкацыі і падробкі так званай грамадскай думкі» (Ленін У. І. Тв., т. 28, с. 439). З узнікненнем міжнар. рабочага руху паяўляецца рабочая і камуністычная Ж. Сучасная камуніст. і дэмакр. Ж. пад кіраўніцтвам камуніст. і рабочых партый адстойвае інтарэсы працоўных, выкрывае хлуслівую сутнасць капіталіст. Ж., праз друк, радыё і тэлебачанне прапагандуе ідэі марксізма-ленінізма, асвятляе пытанні міжнар. і ўнутранай палітыкі, эканомікі і культуры, барацьбу народаў капіталіст. і калан. краін за іх вызваленне ад капіталіст. рабства, вядзе барацьбу супраць бурж. ідэалогіі.

К. Маркс і Ф. Энгельс распрацавалі тэарэт. асновы Ж. Камуністычнай Ж. характэрна непарыўная сувязь з грамадскай практыкай, апора на яе. Найважнейшая яе рыса — навуковасць, выкарыстанне ў ацэнцы працэсаў, з'яў і фактаў навук. крытэрыяў. У. І. Ленін развіў марксісцкую тэорыю Ж. як навуку пра друк у адпаведнасці з новай гістар. эпохай, эпохай пераходу ад капіталізму да камунізма, у адпаведнасці з практыкай пралет. руху і пралет. Ж. Адна з найважнейшых задач сав. журналісцкай навукі — вывучэнне заканамернасцей развіцця друку, радыё і тэлебачання ў сацыяліст. грамадстве. Гл. таксама *Бальшавіцкі друк, Друк, Радыёвяшчанне, Тэлебачанне, Газета, Часопіс, Публіцыстыка.*

Літ.: История русской журналистики XVIII—XIX веков, 2 изд., М., 1966; Цікоцкі М. Я. З гісторыі беларускай журналістыкі XIX ст., Мн., 1960; Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967.

Н. А. Сніцарава. Мінск.

ЖУРНАЛІСЦКАЯ АДУКАЦЫЯ, сістэма падрыхтоўкі журналістаў, творчых супрацоўнікаў друку, радыёвяшчання і тэлебачання.

У Расіі Ж. а. як самастойная галіна адукацыі да Кастр. рэв. не існавала. У 1918 пры Камуніст. ін-це імя Свярдлова арганізаваны цэнтр. газетныя курсы. У 1921 засн. Маскоўскі ін-т журналістыкі (з 1923 Дзярж. ін-т журналістыкі, у 1924—41 Усесаюзны камуніст. ін-т журналістыкі імя «Правды»). У 1924 адкрыты секцыі газетнай справы ў Камуніст. ун-це працоўных Усходу і ў Камуніст. ун-це народаў Захаду. З 1930 расшыраецца сетка камуніст. ін-таў журналістыкі (КІЖ), ствараюцца газетныя адды. ў краявых, абл. камуніст. ун-тах, у Вышэйшай школе прафсаюзнага руху, арганізоўваецца завочная і вячэрняя вучоба журналісцкіх кадраў. Павялічваецца колькасць спрадніх журналісцкіх навуч. устаноў — тэхнікумаў друку, абл., краявых і рэсп. газетных школ. У 1940—41 КІЖ закрыты, Ленінградскі і Свярдлоўскі КІЖы рэарганізаваны ў адды. журналістыкі пры філал. ф-тах Ленінградскага і Свярдлоўскага ун-таў. У гады Айч. вайны журналістаў рыхтавалі таксама Цэнтр. газетныя курсы пры ЦК ВКП(б). У 1946 рэдактарскае адды. створана ў Вышэйшай парт. школе пры ЦК ВКП(б), аддзяленні газетных работнікаў — у рэсп., краявых і абл. парт. школах, у Цэнтр. камсамольскай школе пры ЦК ВЛКСМ. Рыхтуюць журналістаў у СССР (1971) і ун-ты: Азербайджанскі, Беларускі, Вільнюскі, Варонежскі, Далёкаўсходні, Ераванскі, Іркуцкі, Казанскі, Казахскі, Кіеўскі, Кішынёўскі, Латвійскі, Ленінградскі, Львоўскі, Маскоўскі, Растоўскі, Таджыкскі, Ташкенцкі, Тбіліскі, Томскі, Уральскі.

На Беларусі ў 1931 адкрыты газетныя курсы: у Мінску пры ЦК КП(б)Б (пераўтвораны ў адды. газетных работнікаў пры Камвузе) і БДУ, у Гомелі — пры Усебеларускай савецка-партыйнай школе імя Дзяржынскага (існавала ў 1920—36). У 1932 на базе газетнага адды. Камуніст. ун-та Беларусі створаны *Камуністычны інстытут журналістыкі* (КІЖ, тэрмін навучання 3 гады). У 1940 КІЖ рэарганізаваны ў Бел. ін-т журналістыкі з 4-гадовым навучаннем. Пры ін-це працавала адпагадовая вячэрняя школа журналістаў рэсп. маладзёжных газет. Падрыхтоўку кадраў сярэдняй адукацыі вёў Магілёўскі газетны тэхнікум (1931—35, у 1936—38 Усебеларуская газетная партыйная школа). Пасля Айч. вайны падрыхтоўка і перападрыхтоўка журналісцкіх кадраў у БССР сканцэнтравана ў БДУ (у 1944—67 на адды. журналістыкі філал. ф-та; з 1967 на ф-це журналістыкі), у Мінскай вышэйшай парт. школе (з 1946), а таксама на Мінскім адды. Завочнай вышэйшай парт. школы пры ЦК КПСС. Пры Мінскай вышэйшай парт. школе з 1967 працуюць месячныя курсы рэдактараў раённых газет і творчых супрацоўнікаў рэсп., абл. газет, радыёвяшчання і тэлебачання.

Г. Л. Напрэеў. Мінск.

ЖУРУА (Juruá), рака ў Бразіліі, правы прыток Амазонкі. Даўж. 3283 *км*. Пачынаецца ў перадгор'ях Перуанскіх Андаў. Цячэ сярод вільготных і вечназялёных лясоў. У межах



1



2

Жывапіс І. 1. В. А. Трапінін. Партрэт Яршовай з дачкой. 1831. 2. І. Я. Рэпін. Месячная ноч. Здраўнева. 1896. 3. У. Я. Маковскі. Песміст і аптыміст. 1893. Усе ў Дзярж. маст. музеі БССР.




3



Жывапіс II. 1. І. І. Шышкін. Палессе. Балота. Журавы. 1890. 2. А. Я. Галавін. Партрэт М. Э. Траянавай. 1916. 3. П. А. Малявін. Сялянка ў чырвонай сукенцы. 1900-я г. Усе ў Дзярж. маст. музеі БССР.



2



3




1


Жывапіс III. 1. А. М. Герасімаў. Сямейны партрэт. 1934. Дзярж. маст. музей БССР. 2. В. К. Цвірка. Сказ пра Палессе. 1965. Дзярж. маст. музей БССР.



2



Жывапіс IV. 1. К. М. Касмачоў. Незабыўнае. Цэнтр. частка трыпціха. 1962. Дзярж. маст. музей БССР. 2. М. В. Данцыг. Мой Мінск. 1967. Дзярж. маст. музей БССР.



Амазонскай нізіны рэчышча вельмі звілістае. Многаводная ўвосень (крас.— май), мялее летам (вер.— кастр.). Суднаходная ад г. Крузейру-ду-Сул да вусця.

ЖУРБІХІ, вёска ў Вілейскім р-не Мінскай вобл., каля р. Вузлянка (1,5 *км*). Цэнтр Кузьміцкага с/с і калгаса «Кузьмічы». За 18 *км* на Пн ад Вілейкі, 120 *км* ад Мінска, 15 *км* ад чыг. ст. Вілейка, на шашы Вілейка — Паставы. 258 ж., двароў 98 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, вет. пункт, дзіцячы сад, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЖУЧКЕВІЧ Вадзім Андрэевіч [н. 6(19).11. 1915, мяст. Лоеў Мінскай губ.], беларускі савецкі географ. Д-р геагр. н. (1971). Чл. КПСС з 1945. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1939). У 1949—64 працаваў у сістэме асветы. Дацэнт кафедры фіз. геаграфіі БДУ (з 1961). Працы па тапаніміцы, эканам. геаграфіі, методыцы выкладання геаграфіі. Аўтар многіх дапаможнікаў па геаграфіі для школ і ВНУ Беларусі.

Тв.: (Разам з Малышавым А. Я. і Рагозіным Н. В.) Города и села Белорусской ССР, Мн., 1959; Общая топонимика, 2 изд., Мн., 1968; Топонимика Белоруссии, Мн., 1968; География БССР (падручнік для школ), Мн., 1970.

ЖУЧКІ, вёска ў Ганчарскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Чкалава. За 23 *км* на Пд ад Ліды, 155 *км* ад Гродна, 2,5 *км* ад чыг. ст. Ганчары, на шашы Ліда — Слонім. 189 ж., двароў 64 (1971). Пачатковая школа, клуб, бібліятэка, магазін.

ЖУЧКОЎ Ціхан Сідаравіч (н. 4.7.1922, в. Бахацец Магілёўскага пав. Гомельскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). Са служачых. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Магілёўскі аэраклуб (1941), Ейскае ваен.-марское авіяц. вучылішча (1942). У Чырв. Арміі з 1941. У Айч. вайну на Балт. флоце — лётчык-знішчальнік. Вызначыўся пры прарыве блакады Ленінграда і вызваленні Ленінградскай вобл. Зрабіў 257 баявых вылетаў, правёў 37 паветр. баёў, асабіста збіў 10 варожых самалётаў, 11 у групе. У 1945—60 лётчык-выпрабавальнік. Жыве ў Маскве.



ЖЫВА, персанаж з міфалогіі зах. і ўсх. славян, багіня жыцця, урадлівасці, дачка бога Траяна. Ей прысвячалі гаі, дубровы, будаваліся храмы.

ЖЫВАКІНІ Васіль Ігнатавіч [1805—18(30). 1.1874], рускі акцёр. Сын прыгоннай бел. балерыны П. Азарэвічавай (гл. *Азарэвічы*) і італьян. мастака Джавакіна дэла Мома. З 1825 у Малым т-ры. Вызначыўся як камік-буф у вадэвілях. Спалучаў прастату, натуральнасць выканання з яркай гратэскавасцю, буфанадай, імправізацыяй (часта сатырычнай). Лепшыя ролі: Жавіяль, Сіпічкін («Страчны пад сталом», «Леў Гурыч Сінічкін» Дз. Ленскага), Мардашоў («Аз і Ферт» П. Фёдарава). Пераносіў вадэвільныя прыёмы ў класічную камедыю: Арган («Школа жонак» Мальера), Груміо («Утаймаванне свавольніцы» У. Шэкспіра), Падкалесін («Жаніцьба» М. Гогаля), Расплюеў («Вяселле Крачынскага» А. Сухаво-Кабыліна). Родапачынальнік сям'і рускіх акцёраў Жывакіні.



Літ.: Дмитриев Ю. Московского Малого театра артист Живокини, «Театр», 1960, № 9.

ЖЫВАКОСТ (Symphytum), род шматгадовых цвёрдаапушаных травяністых раслін сям. бурачнікавых. Вядома больш за 20 відаў, пашыраных пераважна ў Еўропе, Паўн. Афрыцы і Зах. Азіі. У СССР 9 відаў, на Беларусі адзін — Ж. лекавы (S. officinale).



Жывакост лекавы.

Сцябло выш. да 1 м. Лісце шырокае, цэласнае. Кветкі фіялетава-жоўтыя або блакітныя, сабраныя ў панікулы завіткі. Плод з 4 арэшкаў. Ж. лекавы з брудна-пурпуровымі або пурпурова-фіялетавымі кветкамі. Расце на сырых лугах, па берагах рэк і канаў. Лекавая расліна. Мае атрутныя алкалоіды цынагласін і канзалідзін. Многія віды Ж. вырошчваюцца як дэкаратыўныя. Некат. добрыя меданосы.

Літ.: Гл. пры арт. *Лекавыя расліны.*

ЖЫВАНАРАДЖЭННЕ, вівіпарыя (лац. vivus жывы+pario нараджаю), спосаб узнаўлення патомства, пры якім зародак развіваецца ў матчыным арганізме.

Уласцівае беспазваночным (некат. кішачнаполасцевым, членістаногім, малюскам, чарвям, ігласкурым і інш.), хордавым (некат. рыбам, земнаводным, паўзунам, большасці млекакормячых жывёл, акрамя качканоса, праяхідны і яхідны) і чалавеку. У вышэйшых млекакормячых і чалавека зародак развіваецца ў *матцы* і злучаецца з яе сценкамі *плацэнтай*, праз якую адбываецца газаабмен і жыўленне арганізма. Параўн. *Яйцажыванараджэнне.*

ЖЫВАПІС, від выяўленчага мастацтва; выявы людзей, прыроды, прадметаў і з'яў, зробленыя фарбамі на якой-небудзь паверхні (палатне, дрэве, атынкаванай сцяне). Як і інш. віды мастацтва, адлюстроўвае рэчаіснасць у маст. вобразах, напоўненых ідэйным сац. вместам, і служыць сродкам грамадскага выхавання, уздзеяння на думкі і пачуцці гледачоў.

У Ж. пераканаўча і наглядна можна паказаць аблічча і ўнутр. свет чалавека, грамадскія адносіны людзей, шырокія карціны нар. жыцця, прыроду ў розным стане, рух і зменлівасць з'яў рэчаіснасці, багацце яе фарбаў, якасную своеасаблівасць прадметаў, глыбіню прасторы, святло і паветр. асяроддзе. Ідэйны замысел жывапіснага твора канкрэтызуецца ў якой-н. тэме і ў шмат якіх выпадках — у сюжэце. У аснове эрокавага ўвасаблення замыслу

лянысць мастацтва *кампазіцыі* і *малюнка*. Сучасны рэаліст. Ж. апіраецца на законы лінейнай і паветр. перспектывы, анатоміі, святлоценявай мадэліроўкі (гл. *Святлоцень*). Вызначальная спецыфічная асаблівасць Ж.— шматбаковае выкарыстанне вынуч. магчымасцей і вмац. выразнасці *колеру*, які стварае гарманічнацэласную сістэму *(каларыт)* у творах жывапісу. Каларыстычным сродкі Ж. вельмі разнастайныя. Побач з адным колеравым тонам (манахромны Ж.) ці адценнямі аднаго колеру (грызайль) жывапісцы выкарыстоўваюць тую ці іншую сістэму узаемазвязаных колеравых тонаў *(гама колеравая)*, варыруюць іх надбор, насычанасць і светласць. У творах Ж. ўжываюцца навмення лакальны колер (уласцівы афарбоўцы самога прадмета) і дынамічная, прасторавая распрацоўка колеру, паўтоны і адценні якой накіроўваюць узаемадзеянне розных афарбовак (рэфлексы). Найтанчэйшыя градацыі тону, якія ўзнікаюць ад дзеяння святла, перадаюцца ў валёрным Ж. (гл. *Валёр*). Ж. у выніку доўгага развіцця каларыстычных сродкаў прыйшоў да дакладнага ўзнаўлення натуральнага асвятлення і паветр. асяроддзя *(пленэр)*. Выразнасць Ж. залежыць таксама ад спосабу накладання фарбаў.

Паводле прызначэння, характару вобразаў і выканання адрозніваюць Ж. манументальны і манументальна-дэкаратыўны (насценны росніс, *плафон*, *пано*), станковы (*карціны*, *іконы*), дэкарацыйны (тэатральныя і кінадэкарацыі), дэкаратыўны росніс прадметаў ужытку (гл. *Росніс дэкаратыўны*), *мініяцюру* (ілюстрацыі рукапісаў, партрэты і г. д.; гл. таксама *Станковае мастацтва*, *Манументальнае мастацтва*, *Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва*, *Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва*.) Паводле тэматыкі і прадметаў выяў Ж. падзяляюцца на жанры: гістар., бытавы, батальны, міфалаг., алегарычны, анімалістычны (гл. арт. пра адпаведныя жанры), *партрэт*, *пейзаж*, *натюрморт*, рэліг. жывапіс. Паводле характару фарбавых сувязяў рэчываў і тэхнал. спосабаў замацавання фарбавальнага рэчыва на паверхні адрозніваюць *алейны жывапіс*, *васковы жывапіс*, *клеявы жывапіс*, *тэмперу*, *эмаль*, Ж. вадзянымі фарбамі на тынку — сырым *(фрэска)* і сухім (аль сека), Ж. керамічнымі і сілікатнымі фарбамі. Асобнае месца займаюць *мазаіка*, *вітраж*. Для выканання жывапісных і графічных твораў служаць *акварэль*, *гуаш*, *пастэль*. Паводле тэхнікі пісьма адрозніваюць Ж. шматслаёвы (з падмалёўкай і лесіроўкамі) і Ж. «у адзін прыём» (аль прыма), Ж. з гладкай, злітнай паверхняй, Ж. свабодным, густым (пастозным) мазком і інш.

Ж. узнік у час першабытнаабшчыннага ладу (наскальныя малюнкі, зроблены мінер. фарбамі, вугалем). У краінах Ст. Усходу былі пашыраны ўмоўна-рэчаістыя насценныя росніс (часта з прымі рэаліст. дэталямі), у ант. свеце — вазаны Ж. (гл. *Вазапіс*), фрэска (на шліфаваным тынку), васковы Ж. на драўляных дошках, які дасягнуў вял. выразнасці ў панаве чалавека. У сярэдневяковай еўрап. фрэсцы, абразе (лечнай тэмперай на дрэве, на палотне), у мініяцюры панавалі ўмоўныя рэліг. вобразы. Вызначальныя рысы сярэдневяковага Ж.— падкрэсленая роля контуру, поўная адсутнасць святлоценю, што робіць вымяр плоскасний, ці ўмоўнае яго выкарыстанне, якое хоць і перадае аб'ём прадметаў, але нібы ў перавальным асяроддзі. У феад. эпоху на В. Усходзе вызначальная роля належала мініяцюры, у Паўд. і Паўд.-Усх. Азіі — насценнаму роспісу і мініяцюры, на Д. Усходзе — Ж. тушшу на шоўку і паперы. У эпоху Адраджэння пачаўся росквіт еўрап. рэаліст. Ж.— фрэскі і асабліва карціны (тэмперай, алеем, у т. л. на палатне), якая стала потым асн. формай Ж. Вызваленая з путаў рэліг. дагматыкі творчая думка мастакоў непасрэдна звярнулася да вывучэння вонкавага свету, заканамернасцей рэчаіснасці. Найб. важныя асаблівасці Ж., пачынаючы з 14—15 ст.,— аб'ёмнасць і прасторавая глыбіня вынях, не насычанасць святлом і колерам; гэтаму садзейнічала ўдасканаленне братамі ван Эйкамі тэхнікі Ж. алейнымі фарбамі (мяжа 15—16 ст.). Найб. значным майстрам валяднага Ж. (атрымаў назву з 18 ст.) — Тыцыян, Рэмбрант, Д. Веласкес, Ф. Гоя, Ж. Б. Шардэн, Э. Дэлакруа, К. Мане, у Расіі — А. Іванаў, В. Сурыкаў, В. Сяроў і інш. Важныя перыяды ў развіцці Ж. пасля эпохі Адраджэння — барока, ракако, класіцызм, рамантызм, рэаліст. Ж. Значную ролю ў развіцці пленэрнага Ж. адыграў *імпрэсіянізм*. З 18 ст. рэаліст. свецкі Ж. развіваецца ў Расіі, у канцы 19 — пач. 20 ст. ён збліжаецца з нізам. рухам народа ў творчасці *перасоўнікаў* (І. Рэпін, В. Паленаў, В. Сяроў, У. Маноўскі і інш.). Прагрэсіўны Ж. новага часу праўдзіва і шматгранна адлюстроўвае рэчаіснасць, сцвярджае прынцыпы рэалізму і народнасці ў барацьбе з рэакцыйнымі плынямі (гл. *Дэкадэнцтва*, *Абстракцыянізм*, *Фармалізм*). Жывапісцы СССР і інш. сацыяліст. краін, прагрэс. майстры капіталіст. краін аддаюць сваё мастацтва гуманіст. ідэалам міру, дэмакратыі, сацыялізма і камунізма. Сучасныя сав. мастакі (М. Канчалоўскі, А. Дайнека, А. Герасімаў, С. Герасімаў, І. Машкоў, П. Корын, П. Іагансон, А. Пластаў і інш.) прадоўжылі лепшыя традыцыі сусв. рэаліст. Ж., узбагацілі яго новымі якасцямі. (Больш падрабязна пра гісторыю Ж. гл. раздзел Вынул. мастацтва ў артыкулах пра краіны, рэспублікі, а таксама асобныя арт. пра жанры, стылі і маст. школы.)

Ж. Беларусі набыў самабытныя рысы ўжо на першых этапах гісторыі бел. народа і яго культуры. У 14—16 ст. у бел. кніжнай мініяцюры і іканапісе развіваліся асаблівасці, звязаныя са старарус. традыцыяй, а таксама ўспрынятыя ад зах.-еўран. мастацтва (канопы ўжываюцца з некат. свабодай, фігуры набываюць пластычнасць — мініяцюры Мсціжскага і Аршанскага евангелляў, 14 ст.), у абліччы святых паяўляецца жыццёвасць, вельмі багатай становіцца арнаментацыя (мініяцюры Шарашоўскага евангелля, 1445; абраз Параскевы Пятніцы, 16 ст.). Манумент. сярэдневяковы Ж. амаль не збярогся, але ў працах польскага гісторыка Яна Длугаша ёсць звесткі пра ўдзел бел. майстроў у роспісе інтэр'ераў замкаў і храмаў Літвы і Польшчы ў 14—15 ст. Мяркуюць, што роспісы Благавешчанскай ц. ў Супраслі (сярэдзіна 16 ст.) таксама зроблены бел. майстрамі. У 17—18 ст. бел. іканапіс вызначаецца насычанасцю колеру, аб'ёмнасцю і рэалізмам твараў, хоць новы яшчэ кананічныя і фон умоўны (пазалочаны рэльефны ўзор «Маці Божая — неўгасальны цвет»), які часам замяняецца разьбянымі драўлянымі накладкамі. У абразах паяўляюцца элементы жанру («Раство багародзіцы» Пятра Юсеевіча з Гальніч, 17 ст.) і пейзажа з пачаткамі перспектывы («Жываносная крыніца», 17 ст.). Пачалося развіццё партрэтнага Ж. (партрэты Веспяўскіх, Еўфрасінні Тышкевіч, 17 ст.). Пераход да рэалізму новага часу закончыўся ў бел. Ж. на мяжы 18 і 19 ст.; пра гэта сведчыць творчасць прыгонных партрэтыстаў (Ф. Тулаў і інш.). У пач. 19 ст. многія жывапісцы з Беларусі вучыліся ў Віленскай маст. школе і ў Пецярбургскай АМ (В. Дмахоўскі, С. Заранка, І. Хруцкі). У 2-й пал. 19 ст. ў бел. Ж. відаць тэндэнцыі крытычнага рэалізму (сельскія краявіды братоў А. і І. Гараўскіх, тыпы сялян Н. Сілівановіча). Гэтыя тэндэнцыі і збліжэнне з рус. рэаліст. мастацтвам выяўляюцца ў канцы 19 — пач. 20 ст. ў творчых сувязях В. Вільняніцкага-Бірулі з перасоўнікамі, у змесце карцін Ю. Пэрлі з Я. Кругера. Сімволіка-рамант. рысамі ідэначана творчасць жывапісцаў, звязаных з маст. асяроддзем Вільні і Варшавы («Каля касцёла» Ф. Рушчыца). Пасля Кастр. рэвалюцыі бел. Ж. развіваецца на шляху сацыяліст. рэалізму і дасягае значных поспехаў у 20—30-я г. Ён узбагачаецца новымі тэмамі. Змаганне народаў Расіі і Беларусі за свабоду і незалежнасць, падзеі Кастр. рэвалюцыі адлюстраваліся ў сваіх палотнах майстры жывапісу І. Ахрэмчык («II з'езд РСДРП», «Падпісанне маніфеста аб стварэнні БССР»), В. Волкаў («Гістарычнае пасяджэнне ЦК партыі 10 кастр. 1917 г.»), Я. Зайцаў («Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 г.»). Вобразу У. І. Леніна аддаюць вял. ўвагу многія жывапісцы (партрэты Леніна работы В. Волкава і інш., кампазіцыя К. Касмачова «Напярэдадні»), старонкі гісторыі Беларусі ўзнаўляюць палотны Н. Воранава («Раніца ў Кастрычніку. Мінск, 1917»), В. Цвіркі («Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач»), К. Касмачова («Падпольная друкарня»), Р. Кудрэвіч («Першая рэпетыцыя»). Вельмі шырока, а вял. маст. пераканаўчасцю адлюстравана ў бел. Ж. тэма гераізму сав. народа ў Вял. Айч. вайне, тэма высакароднасці і хараства сав. чалавека. Найб. значныя палотны: «Абаронцы Брэсцкай крэпасці» Ахрэмчыка, «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г.» і «Парад партызанаў у Мінску ў 1944 г.» Зайцава, «Мінск 3 ліпеня 1944 г.» В. Волкава, «Партызанская мадонна», «Віцебскія вароты», «Пакаранне смерцю» М. Савіцкага, «Беларусь — маці партызанская» М. Данцыга, «Палонных вядуць» А. Шыбнёва, «За родную Беларусь» У. Сухаверхава. У высокамастацкіх вобразах бел. жывапісцы раскрываюць тэмы сучаснага жыцця Беларусі, хараства прыроды, духоўнай сталасці яе людзей («Студэнты» В. Волкава, «На зямлі беларускай», «Сказ пра Палессе» В. Цвіркі, «Мой Мінск» М. Данцыга, «Беларускія прыпоўкі» Кудрэвіч і інш.). Тэатр.-дэкар. жывапіс развівалі на Беларусі А. Марыкс, С. Нікалаеў, П. Масленікаў, пазней Я. Чамадураў. У манумент.-дэкар. Ж. і мазаіцы працуюць У. Стальмашонак, Г. Вашчанка, у вітражы — В. Мігаль, В. Ноянак і інш. Іл. гл. на ўклейцы.

Літ.: Всеобщая история искусств, т. 1—6, М., 1956—66; 50 лет советского искусства. Живопись, М., 1967; Кипнис Д. Н. Техника живописи, (6 изд.), М.— Л., 1950; Погасов В. В. О живописи, 2 изд., М., 1960; Недошивин Г. А. Беседы о живописи, 2 изд., М., 1964; Каменский А. Притчи о живописи, М., 1959; Изобразительное искусство Белорусской ССР, М., 1957; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960; Барышаў Г. І. Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва Савецкай Беларусі, [Мн.], 1958; Катастрофа Савецкай Беларусі, Мн., 1960; Маленіна І. В. Беларускі савецкі тэматычны жывапіс, Мн., 1962; Беларускія мастакі на будоўлях сямігодкі, Мн., 1963; Мастацтва Савецкай Беларусі (аўтар тэксту І. Паньшына), Мн., 1968; Ward J. History and method of ancient and modern painting, v. 1—4, London, 1913—21; Cognat R. Histoire de la peinture, v. 1—3, Paris, 1955.

А. В. Лабадава (беларускі жывапіс), *Мінск.*

ЖЫВАРОДНІЯ РАСЛІНЫ, расліны, у якіх на мацярынскай асобіне (у кветках, суквеццях, пладах, на лісці) утвараюцца новыя расліны (парасткі, пупышкі, цыбулінкі і інш.).



Каланхое дэгрэмона.

У адных Ж. р. маладыя расліны утвараюцца з праросласў народкаў у пладах (некат. манграны), у другіх — з асобных вегет. пупышак на месцы кветак або намін імі у суквецці (стэпавы метлюжок, жывародная грачка). Некат. утвараюць на лісці выводкавыя пупышкі або цыбулькі, якія потым ападаюць і прарастаюць (некат. таўсцянкавыя, лілейныя). Ж. р. трапляюцца пераважна у стэпах, тундрах, на высакагорных альпійскіх лугах, дзе расліны за кароткі вегет. перыяд не паспяваюць прайсці цыкл развіцця. На Беларусі з Ж. р. растуць метлюжок цыбульны, цыбуля — агародная, прычасночная і вінаградная, зубніца клубняносная. Як дэкар. вырошчваюць каланхое дэгрэмону і каланхое перыстае.

Літ.: Куроедов Л. И. и др. Ботаника, 7 изд., т. 1, М., 1966; Флора БССР, т. 1, М., 1949.

ЖЫВАРОДНІЯ РЫБЫ, рыбы, якія нараджаюць маляванак.

Жыванараджэнне ўласцівае 4 сям. карпазубых, якія жывуць у трапічных і субтрапічных водах Паўд. і Паўн. Амерыкі, у т. л. і сям. Poeciliidae, да якога належаць *вампуэля* і многія прадстаўнікі акварыумных рыб (гупі, мечаносы, пецылі, гірарднусы). Жывародныя таксама некат. акулы, байкальская галаміна, марскі акунь. У Ж. р. унутранае апладненне. Ікра развіваецца ў яечніках або ў відазмененых яйцаводах.

Літ.: Николъский Г. В. Частная ихтиология, 2 изд., М., 1954.

ЖЫВАЯ ПРАЦА, рабочая сіла ў дзеянні, затрагодныя затраты разумовай і фізічнай энергіі чалавека, якія настаянна арэчаўляюцца ў гатовым прадукце. Неабходная ўмова (адналькава са сродкамі вытворчасці) працэсу вытворчасці. Пры стварэнні прадуктаў Ж. п. далучаецца да набытай, *мінулай працы* і павялічвае багацце грамадства. Падзяляецца на *неабходную працу* і *прыбавачную працу*. Апошняя — крыніца прыбавачнай вартасці, якая прысвойваецца капіталістамі. У вытворчасці з развіццём навук.-тэхн. прагрэсу змяншаецца частка Ж. п. за кошт павелічэння часткі арэчаўленай працы. У бурж. грамадстве павышэнне эфектыўнасці Ж. п. суправаджаецца ўзбагачэннем капіталістаў і пагаршэннем становішча працоўных. Пры сацыялізме Ж. п. вызвалена ад эксплуатацыі, людзі працуюць на сябе, на свой грамадства, таму павышэнне эфектыўнасці Ж. п. з'яўляецца ўмовай росту матэрыяльнага і культ. дабрабыту народа, розанабаковага развіцця чалавечай асобы.

ЖЫВЕЦКІ ВЕК (ЯРУС), жывет (ад горада Жыве на ПнУ Францыі), пазні век (верхні ярус) сярэднедэвонскай эпохі (аддзела) *дэвонскага перыяду (сістэмы)*, наступны на эйфельскім, папярэднічае франскаму. Вылучаны франц. даследчыкам Ж. Гасле ў 1880. Кіравальная фаўна: брахіноды, га-

ніятыты, рыбы. Адклады Ж. в. з марскіх, лагунных і кантынентальных асадкаў пашыраны на тэр. СССР (Усх.-Еўрап. і Сібірская платформы, Урал, Каўказ, Казахстан, Сярэдняя Азія, Алтай, Д. Усход), Зах. Еўропы, Паўн. Амерыкі. На Беларусі адклады Ж. в. трапляюцца па ўсёй тэр., адсутнічаюць толькі ў зах. раёнах (Гродна, Баранавічы, Брэст). Падзяляюцца на тры часткі: ніжнюю — пяскі і пясчанікі (пярмускі гарызонт), сярэднюю — гліны, мергелі, даламіты, гіпсы (пароўскі гарызонт) і верхнюю — пяскі, алеўраліты і гліны (старажскольскі гарызонт). У паўн. і цэнтр. частках БССР магутнасць павялічваецца з захаду на ўсход ад 40—50 *м* да 300—400 *м*, а ў паўд.-ўсх. частцы ад 60 да 200 *м*. У адкладах Ж. в. на Беларусі ёсць нафтаправяўленні (гл. *Прыпяцкая ўпадзіна*), мінер. воды.

Літ.: Гл. пры арт. *Дэвонскі перыяд (сістэма).*

С. А. Кручак. Мінск.

ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, распрацоўвае тэарэт. і практ. пытанні жывёлагадоўлі.

Засн. ў 1949 у Мінску ў сістэме АН БССР як Ін-т жывёлагадоўлі. З 1956 у сістэме Міп-ва с. гасп. БССР, наз. Беларускі НДІ жывёлагадоўлі. Знаходзіцца ў Жодзіне Мінскай вобл. Аддзелы: тэхналогіі вытворчасці малака (сектары: арганізацыі племянной работы ў малочнай жывёлагадоўлі, зоагігіены і ўтрымання, апорны пункт па даследаванні чырвонай бел. жывёлы); тэхналогіі вытворчасці ялавічыны; тэхналогіі вытворчасці свініны (сектар камбікармоў і кармлення, лабараторыя зоагігіены і ўтрымання); генетыкі і развядзення с.-г. жывёлы (сектары: аналітычны, біяхімічнага поліморфізму); кармлення с.-г. жывёлы і тэхналогіі кармоў (лабараторыі: фізіялогіі кармлення, прэміксаў і біялагічна актыўных рэчываў, арг-цыі і выкарыстання сенажацяў і пашы); укаранення, прапаганды і навук.-тэхн. інфармацыі (сектар навук.-тэхн. інфармацыі і патэнтнай службы). Лабараторыі: біялогіі размнажэння і штучнага асемянення с.-г. жывёл; цэнтр. біяхімічная з сектарам зооаналізу. Сектары: конегадоўлі, птушкагадоўлі; віварый. Дзве эксперым. базы, кантрольна-племянная станцыя па свінагадоўлі. Аспірантура з 1950. У ін-це працавалі акад. АН БССР Х. С. Гарагляд, чл.-кар. УАСГНІЛ праф. К. М. Сонцаў. Дырэктар д-р с.-г. н. В. Ц. Горын.

Асн. навук. кірункі: генетыка і развядзенне, кармленне і догляд с.-г. жывёлы, распрацоўка тэхналогіі вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах БССР, эканоміка і арг-цыя жывёлагадоўлі, укараненне выпікаў н.-д. работ у с.-г. вытворчасць. Выпікі навук. даследаванняў: выведзена новая народная група беларускіх чорна-рабых свіней; распрацаваны метады генет. экспертызы паходжання племянной жывёлы, прагнозу гетэрозісу ў свіней пры міжпародным скрыжаванні, глыбокага замарожвання спермы быкоў у пары вадкага азоту, прамысл. скрыжавання ў жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі; прапанаваны найб. эканамічныя тыпавыя кармавыя рацыёны для с.-г. жывёл; выяўлена магчымасць павялічыць біял. паўнацэннасць рацыёнаў свіней, ужываючы сінт. амінакіслоты, макра- і мікраэлементы і інш. біялагічна актыўныя рэчывы; вывучаны хім. састаў і пажыўная каштоўнасць кармоў Беларусі; распрацавана рэцэптура заменнікаў нераззбаўленага малака і інш.

Выдадзены працы: «Кастрамская парода жывёлы ў Беларускай ССР і перспектывы яе развядзення» А. А. Гайко (1953); «Удасканальванне пароды буйной рагатай жывёлы метадам развядзення па лініях» В. М. Карэліна (1962); «Антыбіётыкі на жывёлагадоўчых фермах Беларусі» К. М. Сонцава і інш. (1962); «Метады развядзення і ўдасканальвання парод свіней» Дз. І. Войткі (1964); «Аміна-кіслотнае кармленне свіней» У. В. Шчаглова, А. І. Фіцава (1966); «Чырвоная беларуская жывёла» А. А. Гайко, С. І. Тузава, М. П. Грыня (1968), «Інтэнсіфікацыя і спецыялізацыя жывёлагадоўлі» В. Ц. Горына, А. А. Гайко, К. Ф. Барысаўца (1969); «Новыя дадзеныя хімічнага саставу і пажыўнасці кармоў Беларускай ССР» Е. Дз. Нагорскай і інш. (1969); «Тэхналогія вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах» (1970) і інш. працы. Ін-т выдае тэматычныя зборнікі.

А. П. Галубіцкі. Жодзіна.

ЖЫВЕЛАГАДОЎЛЯ, найважнейшая галіна с. гасп., якая забяспечвае насельніцтва прадуктамі жывёлагадоўлі, дае сыравіну лёгкай і харчовай прамысловасці, а таксама цяглавую сілу і арганічныя ўгнаенні. Уключае малочную, малочна-мясную і мясную жывёлагадоўлю (гл. *Буйная рагатая жывёла), свінагадоўлю, птушкагадоўлю, конегадоўлю, авечкагадоўлю, трусагадоўлю, пчалярства, звяраграгадоўлю* і інш.


У дарэвалюц. Беларусі пераважная частка сялян з-за малазямелля не магла развіваць таварнай Ж. 8,7% сялянскіх гаспадарак, паводле ўсерас. с.-г. і пазямельнага перапісу 1917, не мелі кароў, 20%— коней (1912). Значная частка беднякоў не мела нійкай жывёлы. У памешчыцкіх гаспадарках, асабліва там, дзе былі бровары, адкормлівалі буйн. раг. жывёлу, развівалі малочную Ж., радзей свінагадоўлю.

Сацыяліст. пераўтварэнне с. гасп. стварыла ўмовы хуткага развіцця Ж. У 1970 яе валавая прадукцыя ў 3,6 раза перавысіла ўзровень 1913 і ў 2,9 раза ўзровень 1940. Ж. стала высокатаварнай галіной, якая вызначае спецыялізацыю с. гасп. БССР. У 1968—70 на Ж. прыпадала 71,5% таварнай прадукцыі калгасаў і 68,3% — саўгасаў. У рэспубліцы павялічваецца колькасць буйн. раг. жывёлы, свіней, птушак. З механізацыяй с. гасп. скарачаецца пагалоўе коней, у сувязі з паглыбленнем спецыялізацыі гаспадарак на мяса-малочнай Ж. і свінагадоўлі зменшылася колькасць авечак (гл. табл. 1).

Табліца 1

Пагалоўе жывёлы на Беларусі
(на пачатак года, тыс. галоў)

Усе катэгорыі гаспадарак	1916	1941	1946	1956	1966	1970	1971
Буйная рагатая жывёла	2293	2844	1608	2848	4704	5077	5383
у т. л. каровы	1610	1956	1011	1708	2364	2522	2544
Свінні	2444	2520	724	2245	3688	3651	4005
Авечкі і козы	2050	2578	876	1570	846	670	632
Коні	1843	1170	658	630	382	333	329
Птушкі	—	—	—	16 356	20 551	24 317	27 043



2



Жывапіс У. І. В. Ахрэмчык. Партрэт Героя Савецкага Саюза М. Б. Осіпавай. 1959. 2. В. Волкаў. Партрэт хірурга Ю. Ф. Лося. 1963. Абодва ў Дзярж. маст. музеі БССР.



Я. А. Зайцаў. Партрэт народнай артысткі БССР А. В. Нікалаевай. 1943. Дзярж. маст. музей БССР.

Дзяржава ўсебакова стымулюе развіццё Ж.: павышаны закупачныя цэны на прадукты жывёлагадоўлі, расце *камбікормавая прамысловасць*, павялічваюцца пастаўкі абсталявання для фермаў. Ж. пераводзіцца на прамысл.-навуковую аснову. У кожным раёне створаны вялікія адкормачныя спец. гаспадаркі, рэпрадуктарныя, а таксама племянныя гаспадаркі, якія пастаўляюць калгасам і саўгасам племянную жывёлу. Будуюцца тыпавыя памяшканні для жывёлы, буйныя жывёлагадоўчыя комплексы на вытворчасці прадукцыі на прамысл. аснове, ствараецца культурная паша, укараняюцца дасягненні *заатэхніі, ветэрынарыі* і перадавой практыкі. На 1.4.1971 у калгасах і саўгасах БССР працавала 3236 заатэхнікаў і 4000 ветурачоў, ветфельчараў і веттэхнікаў. Навук. работу ў гэтай галіне гасп. ўзначальвае НДІ жывёлагадоўлі Мін-ва с. гасп. БССР. У выніку спецыялізацыі і канцэнтрацыі Ж., умацавання *кармавой базы* і больш рацыянальнага выкарыстання кармоў павялічваецца вытворчасць прадукцыі (гл. табліцу 2).

Табліца 2

Вытворчасць асноўных прадуктаў жывёлагадоўлі на Беларусі

Усе катэгорыі гаспадарак	1913	1940	1945	1960	1965	1970
Мяса (у забойнай вазе), тыс. *т*	219	275	89	402	508	710
у т. л. свініны	128	134	33	222	303	335
Малака, тыс. *т*	1420	2005	896	3219	4124	5296
Яец, млн. шт.	413	612	189	868	1106	1671
Воўны, *т*	2700	3285	812	2120	1396	1213

Малака ад каровы ў калгасах і саўгасах БССР у 1970 надоена 2108 *кг*, у 1940—886 *кг*. У параўнанні з 1913 вытворчасць мяса павялічылася ў 3,1 раза, малака і яец у 3,7 раза. За гэты час вытворчасць мяса на душу насельніцтва павялічылася з 32 да 79 *кг*, малака з 207 да 587 *кг*. БССР, на долю якой прыпадае 1,8% с.-г. угоддзяў СССР, у 1970 дала 5,7% мяса, 6,4 малака, 4,2% яец у агульнасаюзным аб'ёме вытворчасці гэтых прадуктаў. 84% рэалізаванай жывёлы і 100% таварнага малака даюць калгасы і саўгасы рэспублікі, якія атрымліваюць ад Ж. вялікія прыбыткі. У 1970 рэнтабельнасць вытворчасці ялавічыны ў калгасах БССР склала 42%, свініны 37, малака 16, яец 31%. У 1971—75 валавую вытворчасць мяса ў калгасах і дзяржгасах рэспублікі намечана павялічыць у 1,5 раза, у т. л. свініны ў 2, малака ў 1,4, яец у 1,8 раза.

Ж. развіта ва ўсіх рэспубліках СССР, асабліва ў Прыбалтыцы, на Украіне, у РСФСР. У 1970 у параўнанні з 1916 пагалоўе буйн. раг. жывёлы ў СССР павялічылася з 58,4 млн. да 95,2 млн. (3-е месца ў свеце пасля Індыі і ЗША), свіней з 23 млн. да 56,1 млн. (4-е месца ў свеце пасля Кітая, Бразіліі, ЗША), авечак з 89,7 млн. да 130,7 млн. (2-е месца ў свеце пасля Аўстраліі). У 1970 атрымана жывёлагадоўчых прадуктаў: мяса (у забойнай вазе) 12,3 млн. *т*, малака 83,0 млн. *т*, яец 40,7 млрд. штук.

Літ.: Экономика и организация животноводства БССР, Мн., 1968; Мартинкевич Ф. С. Размещение и специализация сельского хозяйства БССР, Мн., 1961; Экономика Советской Белоруссии. 1917—1967, Мн., 1967; Белорусская ССР за 50 лет, Мн., 1968; Животноводство, Л., 1965 (бібліягр.); Животноводство зарубежных стран, М., 1965.

Ф. С. Марцінкевіч. Мінск.

ЖЫВЁЛЫ (жывёльныя арганізмы), жывыя арганізмы, якія (выключаючы некат. прасцейшых) самі не сінтэзуюць неабходных прадуктаў абмену рэчываў *(гетэратрофныя арганізмы)*. Больш высокаарганізаваныя маюць первовую сістэму, якая ажыццяўляе каардынацыю функцый усіх органаў. Ж. уласцівыя некат. жыццёвыя функцыі (абумоўленыя абменам рэчываў), агульныя з раслінамі. Гэта сцвярджае, што расліны і Ж. аднолькавага паходжання. Вядома калі 1,5 млн. відаў Ж. Асн. тыпы: *прасцейшыя, губкі, кішачнаполасцевыя, чэрві, малюскі, членістаногія, ігласкурыя* і *пазваночныя*. Апошні тып уключае класы: *круглароты, рыб, земнаводных, паўзуноў, птушак, млекакормячых*. Вывучае Ж. *заалогія*.

Літ.: Жизнь животных, т. 1—5, М., 1968—70.

ЖЫВЁЛЬНЫ КРУХМАЛ, тое, што *глікаген*.

ЖЫВЁЛЬНЫ ЭПАС, творы розных эпічных жанраў (казкі, байкі і паэмы), што апавядаюць пра жывёл. Асн. частка — нар. казкі, вельмі ўстойлівыя па форме. Іх гістарычныя карані — у светапоглядзе дакласавага грамадства.

Зніцтаванасць свету жывёл з сац. рэчаіснасцю — характэрная якасць казак пра жывёл. Перанесеныя ў сферу жыццёвых адносін, персанажы гэтых казак дзейнічаюць як людзі, у адпаведнасці з вобразнымі ўяўленнямі народа (напр., пра ваўка-дурня). Спалучэнне рысаў чалавека і жывёл у адным персанажы надае апавяданню займальную ўмоўнасць і жыццёвую яркасць. Даўняй тэндэнцыі да аб'яднання казак пра жывёл у адзіны эпічны цыкл процістаяў працэс іх дыферэнцыяцыі на легендарныя, анекдатычныя, сатырычныя, дыдактычныя (баечныя) і спецыфічна дзіцячыя. Ва ўмовах сучаснай цывілізацыі казкі пра жывёл страцілі ранейшыя грамадскія функцыі і сталі пераважна дзіцячымі (напр., у славян). У народаў, якія ўпершыню прамысел у побыце якіх захаваў першаступенную ролю, сюжэты пра жывёл пераважаюць у рэпертуары і дзяцей, і дарослых.

Агульнасць вуснай творчасці ўсх.-слав. народаў асабліва глыбока раскрываецца ў іх казках пра жывёл. Самыя папулярныя ў рускіх і ўкраінцаў сюжэты казак пра жывёл пашыраны і ў беларусаў. У бел. фальклоры больш сюжэтаў пра жывёл, чым у рускім, але менш, чым ва ўкраінскім. Даследчык усх.-слав. казкі С. Саўчанка ў манаграфіі «Руская народная казка» (Кіеў, 1914) назваў бел. казкі пра жывёл «перламі беларускага казачнага эпасу» і сцвярджаў, што «па маляўнічасці і прыгажосці апавядання» яны «не маюць сабе роўных». Выдатнае іх значэнне падкрэсліваюць Я. Карскі («Белорусы», т. 3, ч. 1, М., 1916), І. Поліўка («Slovanské pohádky», Praha, 1932) і пацвярджаюць новыя даследаванні. Найб. колькасць бел. казак пра жывёл апубл. ў зборніках Е. Раманава, П. Шэйна і М. Федароўскага. Пераказы

падобных казак зрабілі У. Дубоўка, Я. Колас, М. Танк, А. Якімовіч і інш. пісьменнікі.

Сусветна вядомыя літ. помнікі Ж. в. створаны ў Ст. Грэцыі (байкі Эзопа і паэма «Батрахаміямахія», 6—5 ст. да н. э.), у Ст. Індыі («Панчатантра», 3—4 ст.), на стараж. Іране-арабскай культурнай глебе («Каліла і Дымна», 6—8 ст.) і ў сярэдневяковай Еўропе (лац., франц., ням. і галандскія паэмы аб прыгодах ліса, 12—15 ст.). Аснова амаль усіх гатых твораў фальклорная. Матывы сярэдневяковага Ж. в. ў паэме І. В. Гётэ «Рэйнеке-Ліс» (1794). Да Ж. в. маюць адносіны творчасць усіх байкапісцаў. Непасрэдная сувязь з вуснымі казкамі вельмі характэрная бел. і укр. літаратурным байкам.

Літ.: Колмачевский Л. Животный эпос на Западе и у славян, Казань, 1882; Бобров В. Русские народные сказки о животных, Варшава, 1909; Гнатюк В. Деякі уваги над байкою, «Етнографічни вісник», 1916, т. 37—38; Померанцева Э. В. Судьба русской сказки, М., 1965, с. 80—85; Аникин В. П. Искусство психологического изображения в сказках о животных, у кн.: Фольклор как искусство слова, в. 2, М., 1969; Кабашнікаў К. П. Беларуская казка у казачным эпасе славян, Мн., 1968, с. 8—16; Варагі Л. Г. Русские, белорусские и украинские сказки о животных в сравнительном освещении, у кн.: Эпические жанры устного народного творчества, Уфа, 1969 («Ученые записки Башкирского гос. ун-та», в. 33, Сер. филол., № 13); яго ж. Беларуская казка, Мн., 1969; Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі, Мн., 1971; Bahnhardt O. Natursagen, Bd 3—4, Berlin — Leipzig, 1910—12. *Л. Р. Варагі*, Уфа.

ЖЫВІЦА (торпенцін), смалістае рэчыва, якое выдзяляецца пры пашкоджанні вегетатыўных органаў хвойных дрэў. Праарыстая вадкасць, на паветры часткова крышталізуецца. Складаецца з шкіпінару і смаляных к-т. Здабываецца падсочкай, ідзе на выраб *шкіпінару* і *каніфолі*. У БССР атрымліваюць з хвоі звычайнай. Гл. таксама *Торпены*.

ЖЫВІЎ АВЕС, тое, што *авсюн*.

ЖЫГАЛКА Таццяна Іосіфаўна (н. 1.8.1919, в. Лошыца 2-я Мінскага пав.), гаспадарчы дзеяч, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1950. У 1936—50 у органах юстыцыі. З 1952 да 1958 старшыня калгаса «Перамога» Рудзенскага р-на, у 1958—60 старшыня Рудзенскага райвыканкома, у 1960—65 старшыня калгаса «16 партз'езда» Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Дэп. Вярх. Савета БССР 4—6-га скл. Жыве ў Мінску.

ЖЫГАНАЎ Назіб Ганзавіч [н. 2(15).1.1911, Уральск], татарскі савецкі кампазітар. Нар. арт. СССР (1957). Чл. КПСС з 1944. Скончыў Маск. кансерваторыю (1938). З 1945 рэктар, з 1953 праф. Казанскай кансерваторыі. Залажыў асновы нац. опернага мастацтва. Аўтар 8 опер, у т. л. «Качкын» (1938), «Алтынчач» (1940, Дзярж. прэмія СССР 1948), «Памусе» (1949), «Джаліль» (1956), 3 балетаў, 2 сімфоній (1-я — 1937, 2-я «Сабантуй» — 1968, Дзярж. прэмія СССР 1970), сюіты на тат. тэмы (Дзярж. прэмія СССР 1950) і інш. сімф. твораў, кантаты, фп. п'ес, хораў і песень. Дэп. Вярх. Савета СССР 7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Літ.: Гершман Н. Назиб Жиганов, М., 1957.

ЖЫГАНАЎ Уладзімір Васілевіч (27.4.1919, в. Лінаўка Макшанскага пав. Пензенскай губ.— 26.6.1968), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З снежня Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1939. Удзельнік камуніст. падполля ў Полацку (1941—42). У партызанах з мая 1942 — нач. штаба, камандзір атрада, з 15.10.1942 ч. в. а. камандзіра *партызанскай брыгады 3-й Беларускай* Віцебскай вобл., з лютага 1943 нач. штаба брыгады. У 1944—51 на парт. і сав. рабоце ў Полацкім р-не. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ЖЫГАРАЎ Павел Фёдаравіч [6(19).11.1900, в. Брыкава Веськягонскага пав. Цвярской губ.— 2.10.1963], савецкі ваен. дзеяч, Галоўны маршал авіяцыі (1955). З снежня. Член КПСС з 1920. Скончыў Ваен.-навотр. акадэмію імя Жукоўскага (1932). У 1923—37 камандзір узвода, выкладчык ваен.-авіяц. школы, камандзір эскадрыллі, авіябрыгады. З 1938 камандуючы ВПС армій, нам. камандуючага і камандуючы ВПС РСЧА. У 1942—57 нам. галоўнакамандуючага і галоўнакамандуючы ВПС Сав. Арміі, 1-ы нам. міністра абароны СССР. З 1957 нач. Гал. ўпраўлення Грамада. навотр. флоту, нач. ваен. акадэміі. На XIX, XX з'ездах КПСС выбіраўся канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 3—5-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі.



ЖЫГІМОНТ I (Зыгмунт, Сігізмунд) Стары (1.1.1467—1.4.1548), вял. князь Вял. кн. Літоўскага і кароль Польшчы [1506—48], сын *Казіміра IV* і ўнук *Ягайлы*. Мінушку Стары атрымаў за тое, што пры сваім жыцці дамогся каранавання малога сына *Жыгімонта II* Аўгуста. Ваен. і фін. рэформамі спрабаваў умацаваць дзярж. ўладу, што выклікала ўзбр. выступленне магнатаў і шляхты (т. зв. «курыная вайна» 1537). Пры ім шляхта Беларусі, Літвы і Украіны дамаглася роўных правоў з магнатамі, выбарнасці дэпутатаў у сейм і ўвядзення для ўсіх феадалаў адзінага кодэкса законаў — Статута Вял. княства Літоўскага 1529. У 1-й пал. 16 ст. вёў в частыя перапынкамі войны супраць Рус. дзяржавы, у ходзе якіх Расія вярнула Смаленск, Себеж і ў ходзе якіх Расія вярнула Смаленск, Себеж і у ходзе якіх Расія вярнула Смаленск, Себеж і Завалочча. Згадаіўся на нераход да Тэўтонскага ордэна ў Прускае герцагства, залежнае ад Польшчы. Уключыў у склад Польшчы Мазовію (1526).

Літ.: История Белорусской ССР, 2 изд., т. 1, Мн., 1961, с. 111—112; История Польши, т. 1, М., 1956. *И. Р. Казлоўскі*, Мінск.

ЖЫГІМОНТ II (Зыгмунт, Сігізмунд) Аўгуст (1.8.1520—7.6.1572), вял. князь Вял. кн. Літоўскага [1544—72] і кароль Польшчы [1548—72], сын *Жыгімонта I* Старога. Каранаваны ў 1530. Пры ім час быў пад уплывам літ.-бел. магнатаў (асабліва Радзівілаў). Праўленне Ж. супала з перыядам найб. поспехаў рэфармацыі ў Рэчы Паспалітай. Ён спрабаваў захаваць нейтралітет у барацьбе паміж прыхільнікамі рэфармацыі і каталіцкай царквы, але ў апошнія гады падаўся націску вярхоў каталіцтва, увёў абмежаванні для пратэстантаў і згадзіўся на допуск езуітаў (1564), што выклікала ўзмацненне каталіцкай рэакцыі. Пры Ж. вернуты дзяржаве каралеўскія землі, незаконна раздадзеныя ў 1-й пал. 16 ст. магнатам; на тэр. Вял. кн. Літ. пачалося ажыццяўленне валочнай памеры, уведзены *Статут Вялікага княства Літоўскага 1566*. Спрыяў заключэнню *Люблінскай уніі 1569*. У *Лівонскую вайну 1558—83* Ж. галоўны вораг Рус. дзяржавы ў барацьбе за Прыбалтыку. З яго смерцю спынілася дынастыя Ягелонаў.

Літ.: История Польши, 2 изд., т. 1, М., 1956. *И. Р. Казлоўскі*, Мінск.

ЖЫГІМОНТ КЕЙСТУТАВІЧ (Зыгмунт, Сігізмунд; г. н. невядома — н. 1440), вялікі князь Вял. кн. Літ. в 1432, малодшы брат *Вітаўта*. З 1398 князь старадубскі. З дапамогай польска-каталіцкіх колаў уведзены на вялікакняскі прастол літ. феадаламі-католікамі, што выклікала супраць апошніх узброеную барацьбу бел. і укр. феадалаў, якія аграпаваліся вакол кн. Свідрыгайлы. Каб схіліць на свой бок праваслаўных феадалаў, Ж. К. пашырыў на іх прывілеі 1386 і 1413, а ў 1434 гарантаваў феадалам і шляхце недатыкальнасць асобы і свабоды ад натуральных павіннасцей і плацежоў в майнткаў. Фанатык каталіцызму. Увёў у Вял. кн. Літ. інквізіцыю, аддаў Польшчы Валынь і Падолію. Такая палітыка, а таксама праімперская надаароиасць і жорсткасць Ж. выклікалі незадаволенасць бел., укр. і літ. феадалаў, што прывяло да змовы і забойства яго кіпаямі Чартарыйскімі.

Літ.: Соловьев С. М. История России с древнейших времен, кн. 2 (т. 3—4), М., 1960, с. 436—437; Белоруссия в эпоху феодализма. Сб. документов и материалов, т. 1, Мн., 1959, с. 119—121. *М. І. Ермаловіч*, Маладзечна.

ЖЫГУЛЕНКА Яўгенія Андрэеўна (н. 1.12.1920, Краснадар), удзельніца баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. На фронце з 1942, лётчыца, камандзір звена начнога лёгкабамбардзіровачнага авіяпалка. Вызначылася ў баях пры прарыве абароны на р. Проні, пры вызваленні Магілёва, Гродна. Зрабіла 968 баявых вылетаў. Жыве ў Маскве.

ЖЫГУЛІ, узвышша на правабярэжжы р. Волгі, у Куйбышаўскай вобл. Акаймоўваецца выгінам Волгі (Самарскай Лукой). Выш. да 375 *м*. Складзена пераважна з вапнякоў і даламітаў. У нетрах Ж. радовішчы нафты, буд. вапнякоў, асфальту. На паўн. схілах шыракалістыя лясы, на паўд.— лесастэп. Каля паўн. адгор'яў Ж. на Волзе пабудавана Волжская ГЭС імя Леніна.

ЖЫГУЛІ, вёска ў Прудзінкаўскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Праўда». За 5 *км* на ПдУ ад Верхнядзвінска, 170 *км* ад Віцебска, 8 *км* ад чыг. ст. Верхнядзвінск, на шашы Верхнядзвінск — Полацк. 204 ж., ваен. 71 (1971). Клуб, б-ка, ашда, сувязь, магазін. Помнік 38 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЖЫГУЛЯНКА, рака, левы прыток Ясельды (бас. Прыпяці). У ніжнім цячэнні наз. Дарагабуж. Даўж. 44 *км*. Цячэ ў Іванаўскім і Вярозаўскім р-нах Брэсцкай вобл. Працякае праз воз. Чорнае. Вадазабор (595 *км*²) — забалочаная, аблесеная, нарэзаная асушальнымі канавамі нізіна. Жывленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 2,6 *м*³/*сек*.

ЖЫГУПОЎ Уладзімір Раманавіч (н. 9.4.1920, в. Нашковічы Магілёўскага пав.), Герой Сав. Саюза (1945). З снежня. Чл. КПСС з 1945. Скончыў Ваен.-навотр. акадэмію (1955). У Айч. вайну камандзір штурмавога авіяпалка авіяц. палка. Удзельнік баёў на Курскай дузе, каля Харкава, Палтавы, Крывога Рога, Кіраваграда, ліквідацыі Корсунь-Шаўчэнкаўскай групоўкі ворага. Вызначыўся ў час ліквідацыі варожых войск каля Вродаў і пры расшырэнні Сандамірскага плацдарма. Зрабіў 194 баявыя вылеты, знішчыў 9 варожых танкаў, 28 аўтамашын, заглушыў агонь 3 артыл. батарэй, узарваў 3 склады, чыг. эшалон, збіў 2 самалёты. Да 1960 камандзір авіяц. палка. Жыве ў Варонежы.



ЖЫГУЧЫЯ КЛЕТКІ (краніўныя клеткі, нематацысты), клеткі наверхнявога эпітэлію большасці кішачнаполасцевых (за выключэннем грабневікоў), якія выконваюць функцыю нападу і абароны.

Маюць хіцінападобную капсулу са спіральна закручанай жыгучай ніццю ўпярэдзіне і з адчувальным адростакам (шыпікам) на паверхні. Пры дакрананні да яго капсула з сілай выкідвае жыгучую ніць разам з ядавітай вадкасцю, якая парализуе і забівае дробных жывёл, выклікае апёкі і нават смерць буйных жывёл і чалавека (напр., апёкі медуз Gonionemus vertens і Chirodropus).

Літ.: Жизнь животных, т. 1, М., 1968.

ЖЫДКІХ Аляксандр Пятровіч (н. 1925, г. Війск Сібірскага краю), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943, сапёр. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У ноч на 16.10.1943 над варожым агнём адзін з першых у групе дэсантнікаў фарсіраваў Дняпро каля Лоева, агнём падтрымаў пераправу дэсантных груп на правы бераг ракі.

ЖЫДОВІЧ Марыя Андрэеўна [н. 6(19).10.1906, в. Дукора Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі мовазнавец. Д-р філал. н. (1958), праф. ВДУ (1959). Чл. КПСС з 1945. З сям'і нарабка. У 1930—34 настаўнічала. Скончыла Мінскі пед. ін-т (1938). У Айч. вайну працавала ў эвакуацыйным шпіталі, выкладчыцай Уральскага ун-та; з 1943 у ВДУ, у 1946—59 ст. навук. супрацоўнік ін-та мовазнаўства АН БССР. Даследчык гісторыі бел. мовы. Сааўтар кн. «Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Марфалогія» (1957), «Нарысы па гісторыі беларускай мовы» (1957), бібліяграфічнага паказальніка


ніка «Беларускае мовазнаўства. 1825—1965» (1967).

Тв.: Назоўнік у беларускай мове, ч. 1, Мн., 1969.

ЖЫЖАЛЬ, бог агню, апякун рамёстваў у язычніцкай міфалогіі беларусаў.

Уяўляўся магутным дэманам, які пад зямлёю ў вогненнай кузні куе зброю, каб скінуць *Перуна*. Ж. паважалі за мужнасць і непакорнасць, але баяліся. Лічылася, калі Ж. доўга працаваў у кузні, перагравалася зямля і пачыналася засуха, гарэлі тарфяныя балоты, лясы. Калі выходзіў з-пад зямлі, Пярун у гневе кідаў у Ж. вогненныя стрэлы-маланкі. Не папаўшы ў Ж., маланка магла быць прычынаю пажару. У размове з дзецьмі дарослыя часам агонь называюць «жыжаль», «жыжа».

ЖЫЖАЛЬ Іван Мацвеевіч [н. 3(16).6.1904, в. Сыраежкі Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ.], дзярж. дзеяч БССР. Герой Сац. Працы (1964), засл. будаўнік БССР (1962), ганаровы грамадзянін Мінска (1969). Чл. КПСС з 1924. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1935). Прац. дзейнасць пачаў у 1921 на ст. Мінск Маскоўска-Беларуска - Балтыйскай чыг.— рознарабочы, вучань Мінскай школы рамеснага вучнёўства, слесар, пам. машыніста, машыніст дэпо. У 1935—38 прараб, інжынер-канструктар Белдзяржбуда, у 1938—41 дырэктар Бел. дзярж. ін-та прамысл. праектавання (Белпрампраект). З 1944 да 1946 інструктар буд. аддзела ЦК КП(б)Б, заг. аддзела буд. матэрыялаў Дзяржплана БССР. У 1946—50 гал. інжынер Гал. ўпраўлення прамысл. буд-ва пры Савеце Міністраў БССР, у 1950—51 нач. Гал. ўпраўлення па сельскім буд-ве пры Савеце Міністраў БССР. З 1951 да 1953 нач. Гал. ўпраўлення па буд-ве г. Мінска, 1953—55 нам. міністра гар. і сельскага буд-ва БССР. У 1955—69 міністр прамысл. буд-ва БССР. На XX і XXII з'ездах КПБ выбіраўся канд. у чл. ЦК, на XXI з'ездзе — чл. Цэнтр. рэвізійнай камісіі КПБ, на XXIII—XXVI з'ездах КПБ — чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 4—7-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.



ЖЫЖАЎ Мікалай Георгіевіч (1910, в. Цвердуноўка Полацкага пав. Віцебскай губ.— 5.5.1944), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1940. У 1930—41 настаўнічаў у Ветрынскім, Сіроцінскім і Полацкім р-нах. У партызанах з сак. 1942 — камісар, камандзір атрада *партызанскай брыгады імя С. М. Кароткіна*, з лютага 1944 камісар *партызанскай брыгады «За Савецкую Беларусь»* Віцебскай вобл. Загінуў у баі. Узнаг. ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём.

ЖЫЖКА (Žižka) Ян (каля 1360, Троцнаў, Паўд. Чэхія — 11.10.1424), дзеяч *гусіцкага рэвалюцыйнага руху*, палкаводзец, нац. герой чэшскага народа. Змагаўся супраць Тэўтонскага ордэна, мяркуюць, што ўдзельнічаў у *Грунвальдскай бітве 1410*. Пазней быў на каралеўскай службе. Стаў адным з кіраўнікоў і военачальнікаў Табара (цэнтра гусіцкага руху). Атрымаў шэраг перамог над крыжакамі. Выпрацаваў арганіз. прынцыпы нар. войска, умела карыстаўся разнастайнай тактыкай вядзення вайны, стварыў новыя роды войск. Імем Ж. названы адзін з вышэйшых ваен. ордэнаў, вуліцы, плошчы ў ЧССР.



Літ.: Ревзин Г. И., Ян Жижка, [М.], 1952; Мацек Й. Гуситское революционное движение, пер. с чеш., М., 1954; Ярош. Табор в гуситском революционном движении, пер. с чеш., т. 1—2, М., 1956—59.

ЖЫЖМА, рака, правы прыток Гаўі (бас. Нёмана). Даўж. 82 *км*. На тэр. БССР каля 80 *км*. Пачынаецца з балота ў Эйшышскім р-не Літ. ССР, цячэ ў Воранаўскім і Іўеўскім р-нах Гродзенскай вобл. Вадазбор (584 км²) у межах Лідскай раўніны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 3 *м³/сек*. Паблізу в. Германішкі плацінна.

ЖЫЛА (у геалогіі), форма залягання горных парод, якая ўзнікае ад запаўнення шчылін у зямной кары мінер. рэчывам.

Рэчыва паступае з магматычных расплаваў і гарачых растворaў з іх (гідратэрмаў), насычаных лятучымі кампанентамі (борам, хлорам, фторам), утвараючы *байкі*, гідратэрмальныя і пегматытавыя Ж. запаўнення. Адрозніваюць яшчэ Ж. замяшчэння, якія ўзнікаюць ад хім. рэакцый з першаснымі пародамі па шчылінах. Матэрыял Ж. складзены з *жыльных горных парод* ці з кварцу з прымесямі сульфідаў жалеза, каляровых, рэдкіх і высакародных металаў (рудныя Ж.). Паводле формы бываюць простыя і складаныя; адносна размяшчэння ў пародах — пластавыя і сякучыя. Магутнасць нявытрыманая (ад некалькіх сантыметраў да некалькіх метраў, у раздувамі і выкліньваннямі. З Ж. звязаны *гідратэрмальныя радовішчы*.

ЖЫЛІ, вёска ў Іўеўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя XXII партз'езду. За 19 *км* па ПнЗ ад Іўя, 168 км ад Гродна, 12 *км* ад чыг. ст. Гаўя, каля шашы г. п. Іўе — в. Геранёны (0,5 *км*). 168 ж., гасп. 48 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЖЫЛІБЕР (Gilibert) Жак Эмануэль (21.6.1741 — 2.9.1841), французскі натураліст, хірург і анатам. Д-р мед. н. (1763). Скончыў мед. ф-т ун-та ў Манпелье і працаваў у Ліёнскім калежы (1763—74). Заг. мед. акадэміі ў Гродне (1775—81). Заснаваў акушэрскую і вет. школы, клінічны шпіталь (1775—81). Удзельнічаў у адкрыцці мед. ф-та Вышэйшай Літоўскай школы ў Вільні, у заснаванні бат. саду ў Гродне. У 1783 вярнуўся ў Францыю. Удзельнік рэв. 1789—94. Працы па фізіялогіі Беларусі, Літвы, Польшчы, па эпідэміялогіі эндэмічных хвароб у гэтых краінах.

Літ.: Крючок Г. Р. Гродненская врачебная школа второй половины XVIII века и ее руководитель профессор Ж. Э. Жилибер, «Здравоохранение Белоруссии», 1959, № 7.

ЖЫЛІН Аляксандр Іванавіч [н. 4(16).8.1899, Слабада Кукарская Яранскага пав. Вяц-

кай губ.— 6.3.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1927. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Палескай вобл. 28.9.1943 фарсіраваў Дняпро каля Камарына, першы ўварваўся ў ням. траншэю, знішчыў 2 агнявыя кропкі праціўніка, гэтым намог падраздзяленням палка фарсіраваць раку.

ЖЫЛІН Васіль Іванавіч [7(20).8.1915, в. Верхняя Белазёрка Стаўрапольскага пав. Самарскай губ.— 24.7.1947], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны і ў баях на плацдарме. У ноч на 25.6.1944 з групай байцоў адбіў 5 контратак ворага.

ЖЫЛІНСКІ Іосіф Іпалітавіч [8(20).4.1834, Віленская губ.— 1916], рускі геадэзіст. Скончыў Пецярбургскі ін-т інжынераў шляхоў зносін (1854). На геад. аддзяленні Акадэміі Ген. штаба праслухаў тэарэт. курс па геадэзіі і ў Пулкаўскай абсерваторыі прайшоў практыку. У 1863—73 кіраваў градусным вымярэннем дугі паралелі 52° паўн. ш. (на Беларусі прыкладна па лініі Брэст — Пінск — Мазыр — Гомель). Быў нач. трыянгуляцыі зах. тэрыторый Расіі (1881—93). У 1873—98 узначальваў Заходнюю экспедыцыю па асушэнні балотаў Палесся, пазней — забалочаных зямель Маскоўскай, Разанскай, Уладзімірскай губ. Удзельнічаў у астр.-геад. работах за мяжой.

Тв.: Очерк работ западной экспедиции по осушению болот (1873—1898), СПб., 1899.

ЖЫЛІХАВА, вёска ў Бучаніпскім с/с Капыльскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 32 *км* на Пд ад Капыля, 149 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Цімкавічы. 770 ж., двароў 222 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У 1944 вёску часткова спалілі нямфаш. захопнікі. Помнік 101 аднавяскоўцу, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЖЫЛІЦКІ ПАЛАЦ, помнік архітэктуры класіцызму. Пабудаваны ў в. Жылічы (Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл.) арх. К. Падчашынскім у 30-я г. 19 ст. Размешчаны ў глыбіні парку. Спачатку быў пастаўлены гал. 2-павярховы корпус, упрыгожаны 6-калонным порцікам карынфскага ордэра з франтонам і бельведэрам над лесвічнай клеткай, пазней дабудавана доўгае крыло з палацавай царквой, з заламі і жылымі памяшканнямі. Інтэр'еры Ж. п. вызначаліся багатым дэкорам, былі аздоблены пазалочанай ляпнінай, роспісамі, дэкар. тканінамі і карцінамі (унутранае ўбранне загінула ў Айч. вайну). Карпусы палаца ўтвараюць унутр. дворык, шырока адкрыты ў бок парку.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969. *У. А. Чантурыя.* Мінск.


ЖЫЛІЧЫ, вёска ў Дабаснянскім с/с Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Дабасна. Цэнтр саўгаса-тэхнікума «Жылічы». За 28 *км* на ПдУ ад Кіраўска, 115 *км* ад Магілёва, 40 *км* ад чыг. ст. Бабруйск. 1943 ж., гасп. 239 (1971). Пякарня, вытв. майстэрні, швейная і шавецкая майстэрні. Сярэдняя і музычная школы, клуб, 2 б-кі, дзіцячыя яслі-сад, аддз. сувязі, 2 сталовыя, 6 магазінаў, стадыён. У 1942 ням.-фаш. захопнікі расстралялі ў вёсцы каля 200 сав. грамадзян. Помнікі на 3 брацкіх магілах сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. Арх. помнік 1-й пал. 19 ст. *Жылічкі палац.*



ЖЫЛКА Уладзімір Адамавіч (27.5.1900, в. Макашы Навагрудскага пав. Мінскай губ.— 1.3.1933), беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Скончыў гарадское вуч. ў Міры (1914). Вучыўся ў Багародзіцкім (Тульская губ.) аграномічным вуч., бел. гімназіі ў Дзвінску, на гісторыка-філал. ф-це Карлава ун-та ў Празе (1923—26). Пераехаўшы ў Мінск, працаваў у газ. «Звязда», выкладаў л-ру ў муз. тэхнікуме. Друкавацца пачаў (1920) у мінскіх выданнях; з 1921 у зах.-бел. прагрэс. газ. «Наша думка», «Новае жыццё»; з 1923 у органах прагрэс. бел. студэнцтва ў Чэхаславакіі — «Перавясла», «Прамень». Паэт лірычнага складу. Аўтар паэмы «Уяўленне» (Вільня, 1923), зб. вершаў «На ростані» (Віль-

Жыліцкі палац. Агульны выгляд і інтэр'ер залы.






ня, 1924), «З палёў Заходняй Беларусі» (Мінск, 1927). Асн. тэмы: рамант. ўслаўленне барацьбы за свабоду роднага краю, паэтызацыя прац. сялянства, харства прыроды, роздум пра каханне і смерць. Паэзія Ж. адлюстроўвае складанасць шляхоў інтэлігенцыі Зах. Беларусі да рэвалюцыі і сацыялізма, пратэст супраць адчужэння і прыніжанасці чалавека ў бурж. свеце. Перакладаў творы А. Блока, А. Міцкевіча, Г. Ібсена, Ш. Бадлера, І. Волькера, Б. Ясенскага і інш.

Тв.: Вершы, Мн., 1970.

Літ.: Калеснік У. Старонкі бел. рамантызму, «Полымя», 1969, № 1. *У. А. Калеснік.* Брэст.

ЖЫЛКАВА́ННЕ (*первацыя лісця*), размеркаванне жылак (сасудзіста-валакністых пучкоў) у лісцевых пласцінках. Тыпы Ж., як пастаянныя прыкметы, маюць значэнне ў сістэматыцы раслін.

Бывае паралельнае (алакі, асокі), дыхатамічнае (гінкго, некат. папараці), дугавое (ландыш, купена, трыпутнік), сеткаватае (клён, яблыня, шалфей).



Жылкаванне лісця: *1* — паралельнае; *2* — дугавое; *3* — сеткаватае.

Дугавое і паралельнае Ж. ўласцівае аднадольным раслінам. Сеткаватае Ж. маюць пераважна двухдольныя расліны.

ЖЫЛКІН Барыс Дзмітрыевіч [н. 3(15).3. 1895, Гастынскае лясніцтва Варшаўскай губ.], беларускі савецкі лесавод. Д-р с.-г. н. (1966), праф. (1931). Засл. лесавод БССР (1965). Скончыў Петраградскі лясны ін-т (1917). У 1921—26 ляснічы Лубянскага доследнага лясніцтва. У 1926—30 у Казанскім ін-це с. гасп. і лесаводства. Заг. кафедры лесаводства і дэндралогіі Бранскага лесагаспадарчага ін-та (1930—46), Бел. лесатэхн. ін-та (1946—60). З 1961 заг. кафедры лесаводства Бел. тэхналаг. ін-та. Асн. працы па біялогіі і тыпалогіі лясоў, пытаннях павышэння іх прадукцыйнасці, водаахоўнай ролі лесу. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.


Тв.: Опыт изучения типов леса БССР, Мн., 1957; Повышение продуктивности лесов культурой люпина, Мн., 1965.


Літ.: Энтузиаст лесного дела (к 70-летию проф. Б. Д. Жилкина), «Лесной журнал», 1965, № 6.

ЖЫЛЛЁ, збудаванні, у якіх жыве чалавек, створаныя для засцярогі ад неспрыяльнага дзеяння прыродных фактараў і арганізацыі свайго быту. Належыць разам з *прыладамі вытворчасці*, *ядою*, *адзеннем* і *палівам* да асн. матэрыяльных даброт грамадства. Тыпы і разнавіднасці Ж. абумоўлены ўзроўнем развіцця прадукц. сіл, геагр. асяроддзем, формамі грамадскага і сямейнага жыцця, узроўнем буд. тэхнікі (гл. *Будаўніцтва*). У аздобе і абсталяванні Ж. ярка выяўляецца эстэт. густ чалавека.

Найб. простыя тыпы Ж. вядомыя з часоў палеаліту, калі на Ж. выкарыстоўвалі пячоры, будавалі *зямлянкі*, паўзямлянкі, буданы і інш. У стэпавай і паўпустынай палосе Азіі, у Афрыцы і Паўд. Еўропе качавым жывёлаводчым народам характэрна пераноснае Ж. двух відаў: шацёр на стойках з напятымі на іх шкурамі ці шарсцяной тканінай (Тыбет, Афганістан, краіны Пярэдняй Азіі) і юрта з цыліндрычным каркасам з драўляных рашотак і дахам з жэрдак, якія сходзяцца ўверсе (простых — у народаў Цэнтр. Азіі ці выгнутых — у казахаў, кіргізаў, туркменаў). На Крайняй Поўначы Ж. будавалі з каркасам з кітовых рэбраў і снежныя хаціны — іглу. Паляўнічыя і аленяводчыя народы Сібіры і Паўн.-амер. індзейцы карысталіся пераносным Ж. тыпу чума. Пераход на аселае жыццё прывёў да стварэння пасталінных тыпаў Ж. У земляробаў трапічных і субтрапічных абласцей Азіі, Амерыкі, у аселых рыбаловаў Сібіры і Паўн. Амерыкі ўжо з неаліту пашраны драўляныя дамы з каркасам з вертыкальных слупоў з двух або чатырохсхільным дахам. На забалочаных ці заліўных участках будуюцца дамы на палях. Такія пабудовы вядомыя ў Еўропе з неаліту, у наш час бытуюць у Інданезіі, Акіяніі, некат. абласцях Афрыкі і Паўд. Амерыкі. Зруб з гарыз. радоў бярвення (гл. *Хата*) пашраны ў славян і ў некат. інш. народаў Усх. Еўропы. У бязлесных раёнах і горных раёнах (з неаліту) будуюць розныя тыпы глінабітных, гліна-саманавых, цагляных і каменных жылых дамоў з плоскім ці слаба нахіленым дахам (паўд. вобласці Еўропы, Цэнтр. і Сярэдняя Азія, Каўказ, Мексіка, паўд.-зах. раёны Паўн. Амерыкі). Часта такія збудаванні ўтвараюць шмат'ярусныя паселішчы (аулы Дагестана, пуэбла поўдня Паўн. Амерыкі). Пры першабытнаабшчынным ладзе пераважалі абшчынныя жылыя дамы вял. сем'яў, з часам яны саступалі месца жытлам для малой індывідуальнай сям'і. У класавым грамадстве пачынаецца дыферэнцыяцыя тыпаў Ж.: з аднаго боку, хаціны, халупы рабоў і інш. прадстаўнікоў немаёмасных эксплуатаваных класаў, пазней казармы, баракі рабочых; з другога — багатыя дамы, асабнякі і палацы прадстаўнікоў пануючых класаў. Краінам з гарачым кліматам характэрны тып Ж. з групоўкай замкнёных звонку памяшканняў вакол унутр. адкрытых дворыкаў (напр., мегароны Ст. Грэцыі, дамы з атрыем і перыстылем Ст. Рыма, дамы са штучным вадаёмам — хаўзам у Пярэдняй і Сярэдняй Азіі); у краінах з умераным і халодным кліматам найчасцей будуюць прамавугольны ў плане дом, жылыя памяшканні якога асвятляюцца праз

Жыллё эпохі палеаліту, знойдзенае ў в. Бердыж. Раскопкі 1938—39. План складзены У. Да. Будзько па матэрыялах К. М. Палікарповіча (зверху); адназрубнае жыллё старажытнага Бярэсця 13 ст. Раскопкі П. Ф. Лысенкі (1970) на Валынскім в-ве Брэсцкай крэпасці.






вокны ў сценах. З паляўленнем гарадоў адасабляюцца тыпы гарадскога і сельскага Ж. У гарадах побач з індывід. дамамі будуюцца шматпавярховыя дамы на некалькі сем'яў (інсулы Ст. Рыма). Перыяду феадалізму характэрныя *замкі* і *палацы*— Ж. феадалаў. У той жа час складваюцца тыпы сялянскага Ж. розных народаў, якое зберагло свае характэрныя рысы на многія стагоддзі(напр., руская ізба, укр. і бел. хата, швейцарская шалэ, умацаваныя дамы-вежы некат. народаў Каўказа, Балканскага п-ва і інш.; груз. дарбазі, яп. дамы з соўнымі сценамі і інш.). З умацаваннем цэхавых арг-цый рамеснікаў і купецтва ў сярэдневяковых гарадах фарміруецца тып гарадскога дома, у якім спалучаліся жылыя, гандл. і складскія памяшканні, рамесныя майстэрні. У іх выкарыстоўваліся драўляныя канструкцыі (на аснове каркаса ці зруба), а таксама цагляныя, каменныя і мяшаныя (каркасны *фахверк* з цагляным напаўненнем сцен). У дамах прадстаўнікоў пануючых класаў паляўляецца ўсё больш выгод. Высокага маст. ўзроўню дасягае іх архітэктура (напр., італьян. *палацца* эпохі Адраджэння, палацы і *сядзібы*, асабнякі захеўрап. краін 17—19 ст., Расіі 18—19 ст.). Шпаркі рост гарадоў і гар. насельніцтва ў эпоху капіталізму прывёў да рэзкага павышэння кошту зямельных участкаў. Ж. становіцца дадатковым сродкам капіталіст. эксплуатацыі гар. насельніцтва. Пашыраюцца т. зв. «даходныя дамы» з кватэрамі і пакоямі, якія здаваліся ў наймы. Значная частка працоўных наймала куткі ў кватэрах, тулілася ў бараках, казармах, насялляла сярэднія трушчобы. Кантраст паміж раскошнымі асабнякамі, загароднымі віламі буйной буржуазіі, добраўпарадкаванымі кватэрамі забяспечанай часткі гар. насельніцтва і жыллём працоўных асабліва характэрны сучасным гарадам капіталіст. краін (гл. *Жыллёвае пытанне*).

Найб. ранняе Ж., выяўленае на тэр. Беларусі, адносіцца да палеаліту. Каля в. Бердыж (Чачэрскі р-н) знойдзена авальнае ў плане Ж. [(*м*) 4,5×3,4 і 11×5] з вертыкальна ўкапаных касцей маманта на фундаменце з чарапоў. Падобнае Ж. мела сцены з трубчастых, гарызантальна пакладзеных адна на адну касцей, абкладвалася валунамі (в. Юравічы Калінкавіцкага р-на). Шатроваподобны дах падтрымліваўся кроквамі з рэбраў, злучаных з дапамогай прабітых названкоў, і жэрдак, накрываўся скурамі. Усярэдзіне жытла або ў адной з камер знаходзілася вогнішча. З канца палеаліту і ў мезаліце будавалі невялікае часовае Ж.— буданы з агнішчамі (урочышча Грэйск Чачэрскага р-на). Неаліту і бронзаваму веку ўласцівае Ж., укапанае ў вямлю, авальнай або прамавугольнай формы [каля воз. Літвін Калінкавіцкага р-на, в. Добры Бор Баранавіцкага р-на; памеры Ж. ад (*м*) 3×2 да 8×9], а таксама Ж., у якім конусападобны дах трымаўся на слупах (паселішча Сасонка каля в. Лучын Рагачоўскага р-на). Больш складанае Ж. *(пабудовы на палях* або на памостах) знойдзена на тарфяніках, пазёрах (азёры Ула ў Вілейскім р-не, Вейна ў Круглянскім р-не і інш.). У бронзавы век невял. авальнае Ж. (Ксіндзова Гара Быхаўскага р-на; в. Лучын Рагачоўскага р-на) змянілася на прамавугольнае адна- і двухкамернае, паглыбленае да 1 *м* Ж. [памеры да (*м*) 14×7], якое мела тры сцяны з плятня, абмазанага глінай, і двухсхільны дах, што падтрымлівалі слупы. Падобнае Ж. ўласцівае *тшцінецкай культуры* і *сосніцкай культуры* Паўд. Беларусі. Больш рознатыповым стала Ж. ў жалезным веку: паўзямлянкі слупавой канструкцыі пл. не больш за 16 *м²* *мілаградскай культуры* і *зарубінецкай культуры* (в. Чаплін Рагачоўскага р-на). Плямёнам *штрыхаванай керамікі культуры* і *днепра-дзвінскай культуры* ўласцівыя вял. пабудовы слупавой канструкцыі з некалькімі жылымі памяшканнямі [(*м*) да 7×18; агульн. пл. да 120 *м²*; в. Малышкі Вілейскага р-на, в. Збаравічы і в. Лабенішчына Мінскага р-на]. У 5—8 ст. на Пд Беларусі будавалася Ж. паўзаямлянкавага тыпу з печамі-каменкамі (г. Петрыкаў Гомельскай вобл., в. Хатомель Столінскага р-на), на Пн — невял. наземныя хаты слупавой і зрубнай канструкцыі (в. Дзядзілавічы Барысаўскага р-на, Гарадзішча Мядзельскага р-на). У перыяд феадалізму сельскае Ж. на Беларусі — аднакамерныя, двухраздзельныя, трохраздзельныя зрубныя дамы. Найбяднейшым беззямельным сялянам належалі крытыя саломай аднакамерныя дамы (курныя хаты). У двухраздзельным доме паявіліся сенцы, якія часта дзяліліся на 2 часткі: прадняю (уласна сенцы) і заднюю (камора, клець). Сярэднія і заможныя сяляне будуюць трохраздзельную хату з жылой часткаю, сенцамі і прыбудаваным хлявом (уваход у хату цераз сенцы ці цераз двор). Развіццё сельскага Ж. прывяло да стварэння дома, да якога прылягалі, у выпадзе асобных зрубаў, усе гасп. пабудовы сядзібы. Самы дом, апрача сенцаў і двух жылых памяшканняў па баках, меў кухню і асобную спальню. Трохраздзельныя дамы, якія зберагліся ад 19 ст. (в. Слонімцы Пружанскага р-на), маюць прадаўгаватую форму, гасп. пабудовы ідуць углуб двара па восі, перпендыкулярнай да вуліцы (выключэнне — гумно, часта пастаўленае ўпоперак восі ў глыбіні ўчастка). Хаты ў пачатку ўчастка размяшчаліся адна за адною або пад вуглом — «у яліну» (г. п. Шарашова Пружанскага р-на) да вуліцы (традыцыя, у рознай ступені характэрная зах. раёнам Беларусі). Перад дамамі рабіўся агародчык. У вёсках Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абл. пашраны тып т. зв. замчыстай пабудовы, калі будынкі размяшчаюцца кругам вакол унутр. двара. На Палессі хаты размяшчаліся ў двары, і на вуліцу выходзілі толькі вароты з двухсхільным дахам. Дамы будавалі з бярвення ці брусоў (пласцін). Найб. просты фундамент — ніжні вянок бярвення (падрубы). Пазней пад зруб ці пад яго вуглы сталі падкладваць валуны ці драўляныя калоды-штандары («шулы»). Калі фун-

Драўляныя хаты 19 ст.: *1* — у в. Дворнія (Магілёўшчына); *2*, *6* — на Брэстчыне; *3* — у г. Драгічын; *4* — у в. Валеўка (Навагрудскі р-н); *5* — у г. п. Поразава (Свіслацкі р-н); *8* — у Клецку; *9* — у Навагрудку; *10* — у в. Далляцічы (Навагрудскі р-н); *7* — дом сельскага тыпу 19 ст. ў Нясвіжы.




дамент цалкам складаўся з валуноў і камяней, то прызбы не рабілі. Важным і найб. характэрным элементам кампазіцыі хаты быў *дах*, форма якога залежала ад традыц. канструкцыі дома, дахавага матэрыялу, прыпятага нахілу і ўжыванага інструменту. Сельскае Ж. вызначальны ўплыў на архітэктуру памешчыцкіх сядзібных дамоў, якім уласцівыя амаль усе элементы нар. дойлідства, удасканаленага ў адпаведнасці з эканам. магчымасцямі і густам гаспадара. План сядзібнага дома развіўся з сялянскай хаты за кошт не падваення. Меў сіметрычную будову: цэнтр. месца ў плане звычайна належала сенцам, па баках размяшчаліся сталовая і гасцінай, спераду — каморы. Спальні знаходзіліся ў глыбіні дома, уваход у сенцы быў з дворага, фасаднага, боку дома і найчасцей меў ганак са слупамі і высокім трохвугольным франтонам (традыц. ганак у 18 — 1-й пал. 19 ст. часта заменьваўся калонным порцікам). У 18 ст. былі пашыраны *дамы-крэпасці* (дамы з 4, пазней 2 вежападобнымі прыбудовамі-*алькежамі*).

Мураваных сядзібных дамоў на Беларусі будавалася менш, чым драўляных. Планіроўкаю і агульным вонкавым абрысам яны паўтаралі драўляныя сядзібныя дамы (в. Асташына і Міраўшчына Навагрудскага р-на, Мачульна Ваўкавыскага р-на і інш.), часам адрозніваліся ад іх колькасцю паверхаў (в. Скокі Брэсцкага р-на, Хальч Веткаўскага р-на), кампазіцыяй фасаду (в. Янавічы Клецкага р-на) ці архітэктурай, блізкай да певял. палацаў (в. Беніца Маладзечанскага р-на, Нача Воранаўскага р-на). Пераважны тып гарадскога Ж. 9—13 ст.— аднакамерны рублены дом (Ж. 13 ст. ў Бярэсці; раскопкі 1970 на Валынскім в-ве Брэсцкай крэпасці) у «обла» або ў «лапу» [пл. *(м)* 12×25]. Археал. раскопкі сведчаць пра планіровачную і маст. разнастайнасць гарадскога Ж. Малюнкі Ж. можна бачыць на гравюрах 16 ст. (Гродна), 17 ст. (Гродна, Віцебск, Брэст, Клецк), 18 ст. (Магілёў). Найб. поўна характарызуе тыпы гарадскога Ж. «Чарцёж» горада Віцебска 1664: 1-ы тып — аднаязрубны дом без падклецця з двухсхільным дахам; 2-гі — аднаязрубны з прырубам для гасп. мэт; 3-і — двухязрубны дом з сенцамі на падклецці з двухсхільным дахам. 4-ы тып — двухязрубны дом з сенцамі, да доўгага зруба перпендыкулярна прылягае кароткі зруб. Дамы гэтага тыпу маюць даволі вял. вокны, печы з камінамі, ганкі, гасп. прыбудовы. 5-ы тып Ж.— харомы з мноствам пакояў рознага прызначэння, разнастайнымі ганкамі, балконамі-галерэямі, з невял. шатровымі вежамі. Фасады дамоў 17 ст. часта аздабляліся ляпнінаю, роспісам. Значная частка Ж. ў бел. гарадах — драўляная, меней было мураваных дамоў рамеснікаў і гандляроў (з 2-й пал. 18 ст. рабіліся пераважна з цэглы і каменю). Вельмі было пашырана Ж. «фахверкавага» тыпу («прускі мур»). Высокае і вузкае, павернутае тарцом да вуліцы Ж. рамеснікаў і гандляроў групавалася на рынках, пляцах і блізкіх да іх вуліцах (з прычыны вял. шчыльнасці забудовы забаранялася рабіць дамы шырэйшыя, як на 3 акны). Прастора пад шырокім дахам выкарыстоўвалася для жылля. Замест агародчыкаў пачалі рабіць *падчэні* (павеці-галерэі на слупах перад домам), яны засцерагалі ад дажджу выстаўленыя тавары, узбагачалі кампазіцыю Ж., узмацнялі маст. выразнасць гал. фасадаў (дамы з падчэнямі зберагліся ў Іўі, Камянцы, у в. Дзярэчын Зэльвенскага р-на, в. Трабы Іўеўскага р-на). У 18 ст. быў выпрацаваны новы тып мураванага Ж. без падчэняў (т. зв. «Дом рыбака» ў Гродне, не збярогся; «Дом на рынку» ў Нясвіжы, дом у Паставах і інш.). У такіх дамах была майстэрня (крама), якая выходзіла на вуліцу (уваход у яе быў з двара) і аддзялялася ад жылой часткі дома капітальнаю сцяною. Падобнае Ж. (з лаканічна аформленымі фасадамі — дэкор з простых нішаў, карнізаў і рэльефаў) часта мела мансарды пад двухсхільным дахам. Франтоны дамоў часам былі з фігурнымі абрысамі (Нясвіж). Аднатыпныя жылыя дамы ўласцівы цэнтру Паставаў, Гарадніцы ў Гродне (гл. *Гродзенскія дамы Тызенгаўза*). Тыпізацыя ў гарадскім Ж. пашыраецца з канца 18 — пач. 19 ст. ў сувязі з зацвярджэннем рэгулярных планаў забудовы шэрагу бел. гарадоў (гл. *Горадабудаўніцтва*). З аднатыпных жылых будынкаў ствараецца шэраг ансамбляў (Полацк). У 1-й пал. 19 ст. акрамя дамоў, ствараных з улікам практыкі забудовы рус. гарадоў, паяўляюцца дамы, збудаваныя мясцовымі архітэктарамі (Пружаны, Кобрын, Слонім) з улікам канкрэтных умоў і пажаданняў заказчыка. Некат. дамы маюць планіроўку, падобную да гарадскіх сядзібных дамоў; іншыя (большасць) падобныя да Ж. сельскага тыпу. У гарадскім Ж. 1-й пал. 19 ст. пластыка фасадаў вызначаецца развітымі карнізамі, пілястрамі, паўкалонамі,


Гарадское жыллё на Беларусі ў 17 ст.: *1—4* — харомы на падклецці з ганкамі, галерэямі і вежачкамі (па «Чарцяжы» г. Віцебска 1664); *5* — жылыя дамы ў Клецку (паводле гравюры 1613).











Жыллё I.


1. Жылы дом у Магілёве. 1790.
2. Жылы дом у г. п. Ружаны Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. 19 ст.
3. Хата ў в. Слонімцы Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. 19 ст.
4. Асабняк (т. зв. «Дом на рынку») у Навагрудку. Канец 18 ст.
5. Жылы дом у Слоніме. Сярэдзіна 19 — пач. 20 ст.
6. Сядзібны дом ў в. Заполле Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. Канец 18 — пач. 19 ст.
7. Сядзібны дом у г. п. Поразава Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. 19 ст.





1


2


3


4



5


6


7

Жыллё II.

1. Дом-камуна ў Гомелі. 1929—31. Г. Ц. Хінін.
2. Жылыя дамы па вул. Першамайскай у Магілёве. 50-я г. 20 ст. М. Ц. Семяненка і інш.
3. 9-павярховы трохсекцыйны 97-кватэрны жылы дом на пл. Калініна ў Мінску. 1963. С. С. Мусінскі, Г. В. Сысоеў і інш.
4. 9-павярховы аднасекцыйны 54-кватэрны жылы дом у Віцебску. 1970. Ю. В. Шпіт, І. К. Елісееў і інш.
5. Жылыя дамы па вул. Рэспубліканскай у Мінску. 60—70-я г. 20 ст.
6. Жылыя дамы па вул. Юбілейнай у в. Вялікія Эйсманты Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. 60-я г. 20 ст.
7. Жылыя дамы на Смаленскай шашы ў Віцебску. 60-я г. 20 ст.




Гарадское жыллё па Беларусі ў 18 ст.: *1* — дваровы фасад дома ў Паставах; *2* — фасад «Дома па рынку» ў Нясвіжы; *3—4* — фасад і план 1-га паверха ў Магілёве; *5—7* — галоўны фасад, план 2-га паверха і папярочны разрэз т. зв. «Дома Агінскага» ў Гродне.

порцікамі. Развіццё архітэктуры Ж. праходзіла пад уплывам рус. класіцызму («ампірны» дом у Гродне). У 19 ст. ў Мінску, Віцебску, Магілёве паяўляюцца т. зв. «даходныя дамы» (з шматлікімі кватэрамі і магазінамі, якія здаваліся ў наймы). Яны характарызуюць карэнныя змены ў структуры гарадскога Ж.: індывідуальны, на адну сям'ю дом пачынае саступаць месца шматкватэрнаму будынку, які становіцца важным элементам гарадскога цэнтра. Цяжкую спадчыну бел. гарадам пакінуў капіталізм. Неўпарадкаванае Ж. рабочых і беднаты на ўскраінах было рэзкім кантрастам добраўпарадкаваным жылым дамам буржуазіі ў цэнтры гарадоў.

Пасля Кастр. рэв. першым буйным мерапрыемствам Сав. улады быў дэкрэт 1918 аб стварэнні Камітэта па будаўніцтве дзярж. устаноў, які кіраваў капітальным буд-вам і рэстаўрацыяй жылых дамоў. У канцы 20-х г. на Беларусі ўзніклі першыя рабочыя пасёлкі — Чырвоны Кастрычнік пры Асінторфе, Грушаўскі і пасёлак Камінтэрна ў Мінску. У іх будаваліся стандартныя каркасна-шчытавыя 2-павярховыя, 2-секцыйныя дамы з 2- і 3-пакаёвымі кватэрамі. Пачынаецца масавае буд-ва шматпавярховых шматкватэрных дамоў (канец 20-х — пач. 30-х г.). Новыя сац. ўмовы жыцця прадыктавалі сав. архітэктарам новыя тыпы Ж.: інтэрнаты, дзіцячыя сады, дзіцячыя дамы, дамы-камуны — будынкі-комплексы, якія ўключалі жылыя памяшканні і ўстановы камунальна-

Гарадскія жылыя дамы канца 18 — 1-й пал. 19 ст.: *1* — у г. Мір; *2* — у Клецку; *3* — група дамоў 18 ст. ў Слоніме. Сядзібныя дамы 18 ст.: *4* — в. Яцкаўшчына на Гродзеншчыне; *5* — в. Навошчыцы каля Пінска; *6* — в. Дудзічы каля Мінска.




бытавога абслугоўвання (Бабруйск, Гомель). У 1924 складзены «Абавязковыя правілы пра распланаванне паселішчаў і іх забудову» з тыпавымі праектамі дамоў (пераважна 8-кватэрныя брусчатыя дамы заводскага вырабу). У спрэдзіне 30-х г. распрацоўваюцца першыя тыпавыя праекты для 8-, 12-, 24-кватэрных дамоў (Мінск, Магілёў, Барысаў). Жылыя дамы пачынаюць размяшчаць уздоўж магістраляў, практыкуецца квартальная забудова вуліц. Айч. вайна прычыніла вял. страты жыллёваму фонду: фаш. захопнікі знішчылі 391 000 жылых будынкаў. Пасля вайны за кароткі час гарады і вёскі БССР былі адбудаваны (да 1947).

Дабратворны ўплыў на развіццё бел. архітэктуры зрабілі пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР («Аб мерах па далейшай індустрыялізацыі, паляпшэнні якасці і зніжэнні кошту будаўніцтва» ад 23.8.1955; «Аб ліквідацыі празмернасцей у праектаванні і будаўніцтве» ад 4.11.1955; «Аб развіцці жыллёвага будаўніцтва ў СССР» ад 31.7.1957; «Аб мерах па паляпшэнні якасці жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва» ад 28.5.1969 і інш.). У 2-й пал. 50-х г. буд-ва стала ажыццяўляцца індустр. метадамі, выраслі яго тэмпы, умацавалася матэр.-тэхн. база, пачалі працаваць домабудаўнічыя камбінаты. Побач з індывідуальным і дзяржаўным вял. значэнне набыло кааператыўнае буд-ва (на сродкі працоўных з дапамогай дзярж. крэдыту), якому садзейнічала прынятая ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР пастанова «Аб індывідуальным і кааператыўным будаўніцтве» (1962).

З пач. 60-х г. на Беларусі шырокім фронтам ідзе буд-ва буйнапанельных дамоў з палепшанай планіроўкай кватэр. Толькі за 1959—65 у гарадах, рабочых пасёлках і саўгасах БССР здадзена ў эксплуатацыю 15,7 млн. м² жылой плошчы; 90% жылых дамоў з 1961 будуецца па тыпавых праектах. Значнае месца займае буд-ва жылых дамоў з аб'ёмных элементаў. Ідуць пошукі эстэтычна-выразных сучасных арх. формаў і планіровачных прыёмаў. Вял. размах жыллёвага буд-ва, паляўленне буйных масіваў стварылі спрыяльныя ўмовы для шырокага ўкаранення ў горадабудаўнічую практыку больш прагрэс. прыёмаў планіроўкі і забудовы жылых раёнаў. Каб задаволіць сан.-гігіенічныя патрабаванні, сучасныя дамы абсталёўваюцца комплексам бытавых выгод: *асвятленнем*, цэнтр. *ацяпленнем*, *газам*, *каналізацыяй*, *вентыляцыяй*, гарачым і халодным *водазабеспячэннем*, смеццеправодам. У сучасных гасцініцах усё больш выкарыстоўваюцца сістэмы і прылады для кандыцыянавання паветра. Пры буд-ве жылых дамоў улічваюцца пытанні інсаляцыі, стварэння агароджы, сонцазасцерагальныя прылады і інш.

Сучасныя жылыя будынкі па характары жыхарства падзяляюцца на дамы сталага (кватэрнага) і часовага (гасцініцы, інтэрнаты) пражывання; па паверхавасці — на аднапавярховыя (слядзібныя і неслядзібныя), малапавярховыя (2—3 паверхі), шматпавярховыя (4—5 паверхаў) і дамы павышанай паверхавасці (ад 6 і больш); па арх.-планіровачным вырашэнні — на аднасекцыйныя малапавярховыя і шматпавярховыя (вежавага, ці «кропачнага» тыпу), секцыйныя (найб. пашыраны тып), калідорныя, мяшаныя, галерэйныя (не пашыраны на Беларусі тып) і т. зв. малапавярховыя дамы блакіраванага тыпу з прыкватэрнымі ўчасткамі; па сувязі з абслуговымі ўстановамі (за межамі жылога дома — у квартале, мікрараёне, і непасрэдна ў будынку): гасцініцы, інтэрнаты, дамы для маласямейных, эксперым. дамы новага быту. Шматпавярховыя дамы маюць вертыкальныя (ліфт, лесніцы) і гарызантальныя (калідоры, галерэі) сувязі. Інтэрнатам, дзіцячым дамам найб. уласцівы калідорны тып будынка. Асн. тып сучаснага жылога дома — кватэрны, які складаецца з адной або некалькіх кватэр, што маюць адзін ці некалькі жылых пакояў з дапаможнымі памяшканнямі. Найноўшыя тыпы жылых будынкаў для вёскі па сваёй структуры і якасці набліжаюцца да гарадскіх. Асаблівы тып малапавярховых будынкаў (найчасцей слядзібнага тыпу) — дачы. Жылыя памяшканні на часовае пражыванне прадугледжваюцца пры буд-ве матэляў, кемпінгаў, турыстычных і спартыўных баз, дамоў рыбака і паляўнічага. Вял. жылыя карпусы ўваходзяць у комплексы санаторыяў, дамоў адпачынку, пансіянатаў. Асаблівы тып жылых будынкаў спец. прызначэння: дамы

1. План тыпавой секцыі з 4 кватэр 5-павярховага буйнапанельнага дома (арх. У. Пушкін, 1969, Мінск). 2. Тыпавы праект 1-га паверха 2-павярховага 4-кватэрнага дома для сельскай мясцовасці (Белдзіпрасельбуд, 1966). 3. План тыпавога паверха 5-павярховага дома з аб'ёмна-прасторавых канструкцый (арх. У. Цяшкоў, 1969, Мінск).



інвалідаў, састаралых, казармы. У сучасных умовах на Беларусі асн. тып Ж.— адна-, двух-, трох-, радзей чатырох- і пяціпакаёвыя кватэры з карыснай плошчай: ад 28 да 38 м², ад 43 да 50 м², ад 58 да 63 м², ад 63 да 74 м², ад 84 да 91 м². У склад кватэры ўваходзяць: пярэдні пакой, жылыя пакоі, кухня, ванны пакой або душ, санвузел, убудаваныя шафы, часта лоджыя ці балкон. Выкарыстоўваюцца тыпавыя секцыі палепшанай планіроўкі з убудаванай мэбляй, а таксама секцыі з кватэрамі т. зв. свабоднай планіроўкі (кватэра дзеліцца рассоўнымі перагародкамі на розныя па плошчы памяшканні). Кватэры могуць быць вырашаны ў адным або ў двух узроўнях (унізе кухня, санвузел, агульны пакой, наверсе спальня і ванны пакой). Сучасныя дамы манціруюцца з буйных элементаў (буйнаблочныя, панельныя і аб'ёмныя блокі, размерам на пакой і больш). У сувязі з гэтым вял. роля ў паляпшэнні якасці Ж. належыць домабудаўнічым камбінатам.

У СССР і краінах сацыялізма пытанням Ж. аддаецца вял. ўвага, вядзецца масавае жыллёвае буд-ва, каб поўнасцю забяспечыць насельніцтва добраўпарадкаванымі дамамі (гл. *Жыллёвая гаспадарка, Добраўпарадкаванне населеных месцаў*). Гл. таксама арт. пра тыпы Ж., пра краіны, рэспублікі і гарады. Іл. гл. таксама на ўклейках.

Літ.: Энгельс Ф. Да жыллёвага пытання, у кн.: Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; Строительство в СССР. 1917—1967, М., 1967; Страна Советов за 50 лет, М., 1967; Всеобщая история архитектуры, т. 1—2, М., 1958—63; Всеобщая история архитектуры, т. 1—8, Л.— М., 1966—70; История русской архитектуры, 2 изд., М., 1956; История советской архитектуры. 1917—1958, М., 1962; Всеобщая история искусств, т. 1—6 (кн. 1—2), М., 1956—66; Народы мира. Этнографические очерки, М., 1954—66; Токарев С. А. Этнография народов СССР, М., 1958 (бібліягр.); Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период, Мн., 1969; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970; Блом квист Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов, у кн.: Восточнославянский этнографический сборник, М., 1956 (Труды Ин-та этнографии им. Н. Н. Миклухо-Маклая, т. 31); Харузин А. Славянское жилище в Северо-Западном крае, Вильна, 1907; Будько В. Д. О жилищах Бердыжской палеолитической стоянки, М., 1964 (Краткие сообщения Института археологии СССР, в. 101); Лебедева Н. П. Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР, М., 1929; Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов, Мн., 1968; яе ж. К вопросу о развитии белорусского крестьянского жилища, у кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики, М., 1959; яе ж. Из истории развития сельских поселений и усадеб белорусов, «Советская этнография», 1956, № 1; Митрофанов А. Г. и Тарасенко В. Р. Типы жилищ на территории БССР эпохи раннего железа и раннего средневековья, у зб.: Вопросы этнографии Белоруссии, Мн., 1964; Квитницкая Е. Д. Старые городские деревянные дома Юго-Западной Белоруссии, «Архитектурное наследство», 1961, № 13; Загорульский Э. М. Древний Минск, Мн., 1963; Минск. Послевоенный опыт реконструкции и развития, М., 1966; Архитектура гражданских и промышленных зданий, т. 2 — Сербинович П. П. Гражданские здания массового строительства, М., 1967; Архитектура гражданских и промышленных зданий. Жилые здания (под ред. В. М. Предтеченского), М., 1965; Шерешевский И. А. Жилые здания, Л.— М., 1962; Иконников А. В. Эстетические проблемы массового жилищного строительства, Л., 1966; Основы проектирования жилых зданий, Мн., 1960; Архитектура жилого комплекса, М., 1968; Размещение жилищного строительства в городах, М., 1960; Платонов Г. Д. и Повдиняков П. П. Основы развития жилища, М., 1968; Морозова А. С. Современное народное жилище СССР, «Советская этнография», 1963, № 2; Основы проектирования квартиры, М., 1967; Пушкарев И. Твоя будущая квартира, М., 1970; Жуков К. Рассказ о нашем жилище, М., 1970; Шипилов М. А. Жилищный вопрос при капитализме и социализме, М., 1964; Жилые и общественные здания. Опыт зарубежного строительства, М., 1965; Уиттик А. Европейская архитектура XX века, т. 1—2, пер. с англ., М., 1960—64; Ragon M. Города будущего, пер. с франц., М., 1969; Трацэўскі У. В. Драўлянае народнае жытло, «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі», 1971, № 2.

У. Ф. Ісаенка, А. Р. Мітрафанаў, С. П. Мульчэўская, У. А. Чантурыя (жыллё на Беларусі). Мінск.

ЖЫЛЛЁВА-БУДАЎНІЧЫ КААПЕРАТЫЎ, у СССР добраахвотнае аб'яднанне грамадзян для будаўніцтва і эксплуатацыі на ўласныя сродкі жылых дамоў. Стварэюцца Ж.-б. к. прадпрыемствамі (арг-цыямі) або выканкомамі мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных у гарадах і гар. пасёлках.

Карыстаюцца правамі юрыд. асобы, маёмасць Ж.-б. к. з'яўляецца кааператыўнай уласнасцю. Будбанк СССР дае Ж.-б. к. крэдыт — 60% каштарыснай вартасці дома. Членамі Ж.-б. к. могуць быць грамадзяне з 18 гадоў, якія стала жывуць у пэўнай мясцовасці і маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Кожнаму члену кааператыва даецца на сталае карыстанне асобная кватэра з разліку не больш як 15 м² жылой пл. на аднаго члена сям'і, але агульная плошча не павінна перавышаць 60 м². Дзейнасць Ж.-б. к., правы і абавязкі яго членаў у БССР вызначаны Прыкладным статутам Ж.-б. к. ад 1.7.1966.

Кр.: Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларускай ССР, 1966, № 21, арт. 260.

В. Ф. Чыгір. Мінск.

ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА, гл. ў арт. *Будаўніцтва, Жыллёвае пытанне, Жыллёвая гаспадарка.*

ЖЫЛЛЁВАЕ ПРАВА, частка савецкага грамадзянскага права, якая рэгулюе жыллёвыя адносіны. Рэгламентуе парадак давання ў наймы жылога памяшкання, правы і абавязкі наймальніка і наймадаўальніка, памеры кватэрнай платы, абмен кватэрамі і інш.

Жылая плошча ў дамах мясцовых Саветаў выдаецца на падставе рашэння выканкома адпаведнага Савета з удзелам прадстаўнікоў грамадскіх арг-цый, а ў дамах прадпрыемстваў (устаноў) — сумеснага рашэння адміністрацыі і ФЗМК, зацверджанага выканкомам. Наймальнік мае права беспяршкодна карыстацца ўсімі выгодамі кватэры; патрабаваць ад наймадаўальнікаў выканання работ па капітальным і часткова бягучым рамонце; уселяць у памяшканне членаў сям'і; уступаць у выпадках, прадугледжаных законам, у паўторныя жыллёвыя праваадносіны (здаваць у паднаймы, уселяць часовых жыхароў); трымаць за сабою жылое памяшканне на выпадак доўгай адсутнасці; абменьваць жылое памяшканне і г. д. Прымусовае высяленне можа быць толькі ў выключных выпадках, прадугледжаных законам, і звычайна ў судовым парадку. Грамадзянам, якіх высяляюць, даюць звычайна іншае ўпарадкаванае памяшканне. Кватэра не даецца, калі наймальнік сістэматычна псаваў жылое памяшканне, мае ў тым жа населеным пункце ўласны дом, прыгодны для жыцця, або не жыў у кватэры даўжэй тэрміну, на працягу якога за ім і за чл. яго сям'і захоўвалася права на жылое памяшканне, а таксама і ў інш. выпадках.

Кр.: Основы гражданского законодательства Союза ССР и союзных республик, «Ведомости Верховного Совета СССР», 1961, № 50 (1085); Грамадзянскі кодэкс Беларускай ССР, Мн., 1965.

Літ.: Чигир В. Ф. Советское жилищное право, Мн., 1968.

В. Ф. Чыгір. Мінск.

ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ, сацыяльнае пытанне аб задавальненні патрэб у *жыллі*, паляпшэнні жыллёва-бытавых умоў насельніцтва. Спароджана капіталіст. ладам, прыватнай уласнасцю на зямлю і жыллёвы фонд.

Узнікла з развіццём капіталіст. вытворчасці, што выклікала масавы прыток у горад бедных

сялян. Ва ўмовах капіталіст. грамадства Ж. п. невырашальнае, бо жыл. буд-ва падпарадкавана агульным законам капіталізму. Капітал у буд-ве жылля абарачаецца не так хутка, як у некаторых інш. галінах, і прадпрыемцы неахвотна ўкладваюць яго ў жыл. буд-ва. Недахоп жылля, рост цэн на зямельныя ўчасткі для буд-ва дамоў, павышэнне пазыковага працэнта выклікаюць бесперапыннае павышэнне кватэрнай платы і з'яўляюцца дадатковай крыніцай эксплуатацыі працоўных. У ЗША на кватэрную плату выдаткоўваецца да 30% бюджэту сям'і. Узмацняюцца рэзкія жыл. кантрасты: побач з палацамі і раскошнымі кватэрамі прадстаўнікоў пануючых класаў — кварталы халуп і трушчобаў, побач з вострай патрэбай у жыллі (не маюць 8 млн. амер. сем'яў, што жывуць у гарадах) — мноства пустых прыватных кватэр, якіх з-за высокай платы не можа здымаць насельніцтва. Цяжкія былі жыл. ўмовы ў дарэвалюц. Расіі і на Беларусі. Кастр. рэвалюцыя ліквідавала сац. прычыны жыл. патрэбы ў краіне. Адменена прыватная ўласнасць на зямлю, экспрапрыяваны буйныя домаўладанні і перададзены гар. Саветам дэпутатаў працоўных, многія рабочыя пераселены з падвалаў і трушчобаў у кватэры буржуазіі. Жыл. буд-ва ў СССР ажыццяўляецца пераважна на сродкі дзярж. бюджэту на аснове нар.-гасп. планаў (гл. *Будаўніцтва*). Плата за карыстанне кватэрамі не перавышае 4—5% бюджэту сям'і. Пашырана таксама каап. буд-ва (гл. *Жыллёва-будаўнічы кааператыў*), індывідуальнае буд-ва жылля. Шмат якія калгасы БССР будуюць пасёлкі гар. тыпу за кошт гаспадаркі і даюць кватэры сялянам на льготных умовах або бясплатна. Па тэмпах жыл. буд-ва СССР займае адно з першых месцаў у свеце. У БССР за 1966—70 пабудавана больш за 20 млн. м² жылля (у 1971—75 намечана пабудаваць не менш за 22 млн. м²). Гл. таксама *Жыллёвая гаспадарка*, *Жыллёвае права*.

Літ.: Энгельс Ф. Да жыллёвага пытання, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; Ленін У. І. Дзяржава і рэвалюцыя, Тв., т. 25 (Полн. собр. соч., т. 33); Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900—1917, Мн., 1963; Шипилов М. А. Жилищный вопрос при капитализме и социализме, М., 1964; Чигирь В. Ф. Советское жилищное право, Мн., 1968.

В. Ф. Чыгір. Мінск.

ЖЫЛЛЁВАЯ ГАСПАДАРКА гарадская, галіна народнай гаспадаркі па задавальненні жыллёва-бытавых патрэб насельніцтва. Ж. г. ўключае: дзярж. і каап. будынкі; жылыя асабістыя дамы; абагулены дачны фонд; рамонтна-буд. і вытв. гаспадаркі, якія абслугоўваюць гарадскі жыл. фонд.

У дарэвалюц. Беларусі 80% жыл. фонду (3,1 млн. м² жыл. пл.) складалі малапавярховыя і драўляныя будынкі з пячным ацяпленнем. На 1 жыхара было 2,2—2,5 м². Пасля Кастр. рэвалюцыі экспрапрыяваны дамы буйных домаўладальнікаў перададзены гарсаветам. У БССР муніцыпалізавана каля 5 тыс. домаўладанняў агульнай жыл. пл. 1365 тыс. м². Да 1941 гарадскі жыл. фонд БССР у параўнанні з дарэвалюц. павялічыўся ў 4,4 раза. У Айч. вайну больш за 70% яго разбурана. Аднак да пач. 1960 даваенны ўзровень перавышаны на 64%, а ў параўнанні з 1945 — у 3,9 раза (гл. табл.).

Па тэмпах росту жыл. буд-ва БССР апярэдзіла многія капіталіст. краіны. У пасляваенны перыяд узніклі новыя прамысл. гарады з вялікім жыл. фондам (Жодзіна, Наваполацк, Салігорск і інш.). Занава пабудаваная жыл. плошча абсталявана водаправодам, каналізацыяй, цэнтр. ацяпленнем. Дамы будуюцца з трывалых матэрыялаў з улікам усіх відаў добраўпарадкавання і планіроўкі.

У СССР на пач. 1970 жыл. фонд у параўнанні з дарэвалюц. перыядам павялічыўся ў 8 разоў і ў 3,5 раза у параўнанні з 1940, а ўдзельная вага абагуленага фонду склала 68,8%. Гл. таксама *Будаўніцтва*, *Жыллёвае пытанне*.

Літ.: Бропер Д. Л. Современные проблемы жилищного хозяйства, М., 1961; Рост материального благосостояния и культуры белорусского народа, Мн., 1969.

В. В. Бучына. Мінск.

Жыллёвы фонд у гарадах і гарадскіх пасёлках Беларусі [на канец года, млн. м² агульнай (карыснай) плошчы]

	1926	1940	1952	1960	1965	1967	1968	1970
Увесь гарадскі жыллёвы фонд	5,2*	13,8*	13,6	24,4	32,4	36,5	38,7	43,6
у т. л.								
абагулены	1,2	4,0	7,9	12,7	18,9	22,3	24,2	28,6
у асабістай уласнасці грамадзян	4,0	9,8	5,7	11,7	13,5	14,2	14,5	15,0

* За 1926 і 1940 — млн. м² жылой плошчы.

ЖЫЛЛЁВЫ ФОНД, гл. ў арт. *Жыллёвая гаспадарка*.

ЖЫЛУНО́ВІЧ Зміцер Хведаравіч, гл. *Гартны* Цішка.

ЖЫЛЬЕРО́Н (Gilliéron) Жуль (1854—1926), французскі моваznавец, адзін з заснавальнікаў *лінгвістычнай геаграфіі*. З Э. Эдмонам склаў 12-томны «Лінгвістычны атлас Францыі» (1900—12), які мае важнае значэнне для вывучэння франц. мовы і распрацоўкі агульнай тэорыі лінгвістычнай геаграфіі. У тэарэт. працах Ж. адмаўляецца сістэмны характар мовы, а дыялект не лічыцца непадзельнаю тэрытарыяльнаю адзінкаю.

ЖЫЛЬНЫЯ ГО́РНЫЯ ПАРО́ДЫ, магматычныя горныя пароды, якія залягаюць у выглядзе жылаў, даек і іншых дробных целаў, цесна звязаных з інтрузіўнымі масівамі. Трапляюцца ў крышталічным фундаменце Беларусі.

Утвараюцца пры застыванні магмы ў шчылінах зямной кары. Састаў іх адпавядае пародам буйных інтрузій (гл. *Інтрузіўныя горныя пароды*) ці значна адрозніваецца ў выніку працэсаў дыферэнцыяцыі магмы і ўзаемадзеяння яе з прылеглымі горнымі пародамі. Сярод Ж. г. п. вылучаюць меланакратавыя — абагачаныя цёмнаколернымі мінераламі (керсантыт, спесартыт і інш.) і лейкакратавыя — складзеныя пераважна з светлаколерных мінералаў (апліт, пегматыт, плагіяклазіт і інш.).

ЖЫЛЬСКІ Аляксандр Лукіч [н. 9(22).11.1909, в. Мялешкавічы Мазырскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Палескай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1950). У Чырв. Арміі з 1931. З ліст. 1941 у варожым тылу. У ліст. 1942 — маі 1943 камандзір партыз. атрадаў у Ельскім і Мазырскім р-нах. З 1943 камандзір *партызанскай брыгады Мазырскай* імя Аляксандра Неўскага. У 1944—48 старшыня Мазырскага райвыканкома. З 1950 на сав. рабоце ў Гомельскай вобл., з 1961 у Гомелі. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ЖЫЛЯ́НІН Якім Аляксандравіч [н. 9(22).8.1903, мяст. Гайна Барысаўскага пав.], адзін з арганізатараў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1948). У 1927—39 на сав. і парт. рабоце. З мая 1939 заг. аддзела кадраў ЦК КП(б)Б, з снеж. сакратар Магілёўскага абкома КП(б)Б. У 1941—44 упаўнаважаны эвакуацыйнага савета пры СНК СССР, з лютага 1942 сакратар *Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б*. Пасля вызвалення Беларусі сакратар Віцебскага абкома КП(б)Б (чэрв.— кастр. 1944), першы сакратар Полацкага абкома КП(б)Б (кастр. 1944 — май 1946). З 1946 заг. аддзела і нам. сакратара ЦК КП(б)Б па лясной прамысловасці; у 1949—59 старшыня Магілёўскага аблвыканкома. У 1960—66 чл. партКамісіі пры ЦК КПБ. На XVIII—XXII з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 3-га скл., Вярх. Савета БССР 1—5-га скл. Узнагароджаны 5 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

ЖЫЛЯ́РДЗІ (Джылярдзі, Gilardi) Дзяменцій (Даменіка) Іванавіч (1788, Мантаньёла, Швейцарыя — 18.2.1845), рускі архітэктар, прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў свайго бацькі ў Пецярбурзе, потым у Міланскай акадэміі (1806—10). Жыў у Маскве да 1832. Аднаўляў і забудоўваў Маскву пасля пажару 1812. Большасць праектаў і забудоў зроблена з арх. А. Грыгор'евым. Архітэктура будынкаў Ж. мела ўрачысты і строгі характар, што адпавядала агульнай накіраванасці рус. дойлідства пасля перамог у Айч. вайне 1812. Найб. значныя работы Ж.: перабудова Маск. ун-та (1817—19), б. дом Луніных на Суворaўскім праспекце (1823), будынак Апякупскага савета (1823—26), ансамбль гарадской сядзібы Усачовых (1829—31) у Маскве; перапланіроўка і забудова загараднай падмаскоўнай сядзібы Кузьмінкі (20-я г.). Майстар садова-паркавага мастацтва.



Літ.: История русской архитектуры, 2 изд., М., 1956; История русского искусства, т. 8, кн. 1, М., 1963, с. 207—226.

ЖЫ́НКО Сцяпан Рыгоравіч (1897, Рудабельская вол. Бабруйскага пав.— жн. 1919), удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Беларусі. З сялян. Чл. КПСС з 1918. Удзельнік 1-й сусв. вайны. У час ням. акупацыі вёў рэвалюц. работу ў Бабруйскім пав., камандзір партыз. атрада (130 чал.). Пасля вызвалення Бабруйска (ліст. 1918) камандзір батальёна, сфарміраванага з былых падпольшчыкаў і партызанаў. Удзельнік разгрому стракапытаўскага мяцяжу ў Гомелі. З 1919 на фронце. Загінуў у баі пад Бабруйскам.

У. У. Грамовіч. Мінск.

ЖЫНО́ВІЧ (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч [н. 1(14).5.1907, в. Арэшкавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.], беларускі савецкі цымбаліст, дырыжор, кампазітар і педагог. Нар. арт. СССР (1968). Скончыў Бел. кансерваторыю (1941). Творчую дзейнасць пачаў у 1922 як саліст-цымбаліст БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы), у 30-я г. кіраўнік Бел. дзярж. ансамбля нар. інструментаў. У Айч. вайну ўдзельнік франтавых канцэртных брыгад. З 1944 педагог (праф. з 1963) Бел. кансерваторыі, дзе заснаваў клас цымбалаў, з 1946 маст. кіраўнік і гал. дырыжор Дзярж. нар. аркестра БССР. Першы прафесійны выканаўца на бел. цымбалах у сав. час. Яго ігра вызначаецца вернасцю аўтарскай задуме, віртуозным размахам, артыстызмам. Канцэртаваў у многіх гарадах СССР, у Германіі, Фінляндыі, Канадзе. Лаўрэат 1-га Усесаюзнага агляду выканаўцаў на нар. інструментах (1939). Удзельнічаў у рэканструкцыі інструментаў, якія ўвайшлі ў склад Дзярж. нар. аркестра БССР, у стварэнні рэпертуару для гэтага калектыву («Беларуская мелодыя», «Сказанне пра Беларусь», «Лявоніха», апрацоўкі нар. мелодый, пералажэнні твораў класічнай і сав. музыкі). Аўтар п'ес для цымбалаў і фп., квартэта цымбалаў («Беларуская сюіта», «Беларускія танцы», «Беларуская працяжная і карагодная» і інш.). Дзярж. прэмія БССР 1968. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Літ. тв.: Школа для белорусских цимбал, Мн., 1948; Белорусские цимбалы, у зб.: Научно-методические записки Белорусской государственной консерватории, в. 1, Мн., 1958; Государственный белорусский народный оркестр, Мн., 1958; Оркестр цимбалистов, Мн., 1968.

Літ.: Насценка З. Іосіф Жыновіч, Мн., 1969.

А. Я. Ракава. Мінск.

ЖЫРАВЕ́ЦКАЯ КАМЯНІ́ЦА, вёска ў Брэсцкім р-не, на р. Каменка. Цэнтр Жыравецкага с/с. За 7 *км* на ПдУ ад Брэста, 7 *км* ад чыг. ст. Каменная, на шашы, якая злучае вёску з Брэстам. 265 ж., двароў 95 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 2 брацкія магілы 117 савецкіх воінаў і партызанаў Айчыннай вайны.

ЖЫРА́НІК (Żyranik) Багдан (н. 11.4.1892, Варшава), польскі паэт і перакладчык. Друкуецца з 1909. На Кастр. рэв. адгукнуўся рэвалюц. песнямі (1918). У 1919—20 збіраў этнагр. матэрыялы на Палессі. Склаў (пераважна з уласных перакладаў) анталогію бел. паэзіі (рукапіс згублены ў 2-ю сусв. вайну). У кн. «Нарыс беларускай літаратуры» (1921) разглядае шляхі развіцця бел. пісьменства ад Ф. Скарыны да Я. Купалы і М. Багдановіча, Папулярызатар бел. л-ры ў Польшчы. Перакладчык твораў Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Багушэвіча, Цёткі, М. Багдановіча, З. Бядулі, М. Танка, П. Панчанкі і інш.

А. І. Мальдзіс. Мінск.

ЖЫРА́ФЫ (Giraffidae), сямейства жвачных жывёл атр. парнакапытных. 2 роды: уласна Ж. і акапі, пашыраныя ў Афрыцы, пераважна ў саванах.

Маюць адносна кароткае тулава (да 3 *м*), доўгую шыю, невялікую галаву з 3—5 укрытымі скурай касцявымі рожкамі. Пярэднія ногі даўжэйшыя за задніх. Развіты і іклаў у верхняй сківіцы няма. Роду ўласна Ж. (Giraffa) належаць 2 віды: Ж. звычайная (G. camelopardalis), Ж. сетчатая (G. reticulata). Масць у гэтых відаў плямістая (вялікія цёмна-карычневыя плямы на светлым фоне або раздзеленыя вузкімі, светлымі прамежкамі, падобнымі на сетку). Жывуць статкамі па 6—8 асобін (1 дарослы самец, самкі і маладняк). Корміцца пераважна лісцем і галінамі акацый. У чэрв.— ліп. нараджаецца 1 дзіцяня. Да роду акапі належыць 1 від Okapia johnstoni, упершыню апісаны ў пач. 20 ст. Мае карацейшую шыю, чырванавата-рыжае без плямаў тулава, на нагах чорныя і белыя палосы. Пашырана толькі ў цэнтр. Афрыцы.



Жырафа звычайная.

Літ.: Гл. пры арт. *Млекакормячыя.*

ЖЫРКЕ́ВІЧ Іван Сцяпанавіч (1789, Смаленск — 1848), віцебскі губернатар у 1836—38, аўтар мемуараў, каштоўных як крыніца па ваен., паліт. і бытавой гісторыі Расіі і Беларусі 1-й пал. 19 ст. Праводзіў рэакцыйную палітыку.

Тв.: Записки, «Русская старина», 1874, т. 9—11; 1875, т. 13; 1876, т. 16—17; 1878, т. 22—23; 1890, т. 67.

ЖЫРКЕ́ВІЧ Міхаіл Іванавіч [н. 1(13).10. 1899, в. Залесавічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі моваznавец. Засл. дз. нав. БССР (1951). Канд. пед. н. (1944). З сялян. Скончыў БДУ. Удзельнік грамадз. і Айч. войнаў. Працаваў настаўнікам, выкладчыкам у Магілёўскім пед. ін-це (1933—41), у БДУ (1943—69, у 1953—68 заг. кафедры бел. мовы). Аўтар падручнікаў для сярэдняй і сямігадовай школ, прац па пытаннях сучаснай бел. літ. мовы. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: (Разам з Ю. А. Шакалём) Граматыка беларускай мовы, ч. 1, 4 выд., Мн., 1940; (разам з А. С. Карзонам) Граматыка беларускай мовы, ч. 1, 8 выд., Мн., 1954; тое ж, ч. 2, 11 выд., Мн., 1955; Падручнік беларускай мовы, ч. 1, 16 выд., Мн., 1970; тое ж, ч. 2, 8 выд., Мн., 1963.

Літ.: Міхаіл Іванавіч Жыркевіч, «Веснік БДУ імя У. І. Леніна, Сер. 4. Філалогія і журналістыка», 1969, № 3.

ЖЫРМУ́НСКІ Аляксандр Мацвеевіч (11.6. 1887, г. Чэмбар Пензенскай губ.— 9.5.1970), беларускі савецкі геолаг. Чл.-кар. АН БССР (1936), д-р геолага-мінералаг. н. (1944), праф. (1944). Скончыў фіз.-матэм. ф-т (па спецыяльнасці геалогія) Маск. ун-та (1913). У 1915—16 праводзіў гідрагеалагічныя даследаванні ў Смаленскай, Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай губ. У 1918 кіраваў геалагічнай здымкай маштабу 1 : 420 000 Еўрапейскай




часткі Расіі. З 1927 ст. геолаг Геалагічнага камітэта ВСНГ. Працаваў ст. геолагам Мін-ва геалогіі СССР, заг. аддзела агляднай геал. картаў, секцыі геалогіі і групы чацвярцічнай геалогіі. У 1936—38 дырэктар Ін-та геалогіі АН БССР, заг. кафедры геалогіі БДУ імя Леніна. З 1943 да 1945 кіраваў геал. групай АН БССР. Навук. працы па чацвярцічнай геалогіі, гідрагеалогіі, геамарфалогіі, тэктоніцы.

Тв.: Основные черты тектоники Западного края, «Известия Московского отделения Геологического комитета», 1919, т. 1; Подземные воды Западного края, «Материалы по общей и прикладной геологии», 1927, в. 63; Главный девонский вал Северо-Западного края, «Известия Главного геологоразведочного управления», 1930, т. 49, № 4; Принципы и методы составления карт четвертичных (антропозойских) отложений, «Известия АН БССР. Сер. геолог.», 1947, № 2; Геологические особенности тектонических структур БССР, ч. 1—2, там жа, 1948, № 5—6.

Літ.: Погуляев Д. И. Александр Матвеевич Жирмунский, «Сборник научных работ Смоленского краеведческого НИИ», 1958, в. 2.

ЖЫРМУ́НЫ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 16 *км* на ПдЗ ад Воранава, 133 *км* ад Гродна, 10 км ад чыг. ст. Бастуны, на шашы Ліда — Вільнюс. 587 ж., гасп. 198 (1971). Эксперым. база «Кастрычнік» Гродзенскай абласной с.-г. доследнай ст., лясніцтва, млын, сепаратарны пункт, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік камсамольцам-актывістам, якіх у 1943 загубілі ням.-фаш. захопнікі.

ЖЫРО́ВІЦКАЯ БОГАЯЎЛЕ́НСКАЯ ЦАРКВА́, архітэктурны помнік барока. Створана ў 1769 у в. Жыровічы (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.), уваходзіла ў ансамбль колішняга уніяцкага манастыра. Бязвежавая царква-



Жыровіцкая Богаяўленская царква. Выгляд з паўднёвага захаду і план.

капліца. Уражанне выцягнутасці ў вышыню ствараецца пучкамі паўкалон, разьбяным шчытом на гал. фасадзе, які выходзіць за межы аб'ёму і закрывае бакавыя сцены царквы. Накрыта двухсхільным дахам, увенчаным у сярэдняй частцы дэкар. драўляным пафарбаваным барабанам (мае філянговую апрацоўку) з купалам.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 523—525.


ЖЫРО́ВІЦКАЯ ГЕОРГІЕЎСКАЯ ЦАРКВА́, помнік драўлянага дойлідства. Пабудавана ў

в. Жыровічы (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.) у канцы 18 ст. Адпаязрубны храм з алтарным прырубам. Шырыня апсіды блізкая да шырыні асн. часткі царквы. Галоўны фасад завершаны квадратным барабанам з купалам. Простае планава-аб'ёмнае вырашэнне, сціплы дэкор збліжае архітэктуру царквы з архітэктурай нар. жылля.



Жыровіцкая Георгіеўская царква.

ЖЫРО́ВІЦКАЯ КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА́, архітэктурны помнік 2-й пал. 18 ст., царква-капліца. Пабудавана ў стылі «віленскага барока» ў 1769 у в. Жыровічы (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.). Уваходзіла ў ансамбль колішняга уніяцкага манастыра. Была кальварыяй — храмам, прысвечаным пашырэнню ў 18 ст. абраду, які імітаваў паломніцтва ў Іерусалім. Пастаўлена на ўзгорку. Унутраныя ўсходы, якія займаюць палову будынка, маюць ілюзорны жывапісны працяг на алтарнай сцяне і быццам вядуць да купала, дзе знаходзіцца распяцце. Гэты прыём ствараў уражанне вял. глыбіні інтэр'ера пры параўнаўча невялікіх памерах




Жыровіцкая Крыжаўзвіжанская царква. Фасад (злева), разрэз і план храма.


царквы [план будынка *(м)* 12×25]. Храм мае вузкі гал. фасад, выцягнутыя прапорцыі, дзве стройныя вежы, размешчаныя адна за адной па канцах фасада.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968, с. 523—525. *У. А. Чантурыя.* Мінск.

ЖЫРО́ВІЦКІ УСПЕ́НСКІ САБО́Р, архітэктурны помнік 17 — 1-й пал. 19 ст. Заложаны як гал. храм колішняга уніяцкага манастыра ў в. Жыровічы (Слонімскі р-н Гродзенскай вобл.). Спачатку пабудаваны ў стылі барока (закончаны ў 1650). Манумент. збудаванне (даўж. больш за 55 *м*, выш. каля 40 *м*) з трохнефавым аднаапсідным планам. Раней меў у гал. частцы 2 вежы, за якімі ўзвышаўся купал. Пасля рэканструкцыі (1-я пал. 19 ст.) вежы разабралі, фасад атрымаў франтоннае завяршэнне, змяніўся дэкор і форма светлавога барабана купала; храм набыў класіцысцкія рысы, а партал гал. фасада — матывы візант. архітэктуры. Інтэр'ер астаўся барочны: купал падтрымліваюць масіўныя слупы складанага сячэння, сцены



Жыровіцкі Успенскі сабор. План і агульны выгляд (уверсе).



падзелены пілястрамі, нефы аб'яднаны высокімі аркамі, скляпенні аздоблены стукавым арнаментам і інш.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 6, М., 1968; Чантурия В. А. Архитектура Белоруссии конца XVIII — начала XIX в., Мн., 1962; Яго ж. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969.

У. А. Чантурыя. Мінск.

ЖЫРО́ВІЧЫ, вёска ў Слонімскім р-не Гродзенскай вобл., каля р. Шчара (1 *км*). Цэнтр сельсавета. За 10 *км* на Пд ад Слоніма, 175 *км* ад Гродна; аўтобусная ст. на шашы Слонім — шаша Брэст — Слуцк. 2597 ж., двароў 430 (1971). Лясніцтва, торфазавод «Прусоўшчына», дзярж. племянная станцыя, камбінат быт. абслугоўвання. Тэхнікум механізацыі с. гасп., сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аддз. сувязі, сталовая, кафэ, 6 магазінаў. У Ж. збярогся арх. ансамбль — комплекс мураваных будынкаў колішняга уніяцкага манастыра, які (паводле падання) заложаны ў 1470 (першапачатковая драўляная забудова не асталася). Сярод помнікаў 17 — 1-й пал. 19 ст.: *Жыровіцкі Успенскі сабор, Жыровіцкая Богаяўленская царква, Жыровіцкая Крыжаўзвіжанская царква,* комплекс манастырскіх будынкаў (сярэдзіна 18 ст.), званіца (1-я пал. 19 ст.). Помнік драўлянага дойлідства канца 18 ст.— *Жыровіцкая Георгі-*

еўская царква. Помнік на брацкай магіле 47 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. Помнік невядомаму салдату.

ЖЫТА (Secale cereale), аднагадовая расліна сям. злакавых; адна з найважнейшых *збожжавых культур*. Дае пажыўны, каларыйны хлеб, які мае паўнацэнныя бялкі, вітаміны А, В, Е і інш. рэчывы. З Ж. атрымліваюць канцэнтраваныя, грубыя, самыя раннія зялёныя кармы, сілас, салому. У культуры адна разнавіднасць Ж.— S. cereale v. vulgare Körn. Вырошчваецца ў азімай і яравой формах, на Беларусі — толькі азімае Ж., найменш патрабавальная і самая марозаўстойлівая сярод збожжавых культур. Пераносіць т-ру ад —25 да —30 °С (на глыб. вузла кушчэння). Хутка адрастае ўвесну, таму добра процістаіць пустазелью. Аптымальныя тэрміны сяўбы: на мінеральных глебах у паўночнай зоне рэспублікі 25 жніўня — 15 вер., у паўднёвай зоне 30 жніўня — 15 вер.; на тарфяна-балотных глебах адпаведна 1—15 і 5—20 верасня. Найлепшы спосаб сяўбы вузкарадковы. Пашыраныя сарты: Беняконскае (выведзена ў 1950 на Беняконскай с.-г. доследнай станцыі Гродзенскай вобл.); Партызанскае мясцовае (раянавана з 1950); Літоўскае 3; Дружба (выведзена ў Бел. НДІ земляробства, раянавана з 1970); Харкаўскае 60. У Бел. НДІ земляробства створаны (1965) сорт тэтраплоіднага Ж. Белта (падвоеная колькасць храмасомаў), які вызначаецца добрай ураджайнасцю, буйным зернем, устойлівы да палягання. Раянаваны на дзярнова-падзолістых і тарфяна-балотных глебах (1969). У калгасе «Аснежыцкі» (Пінскі р-н) атрыманы ўраджай Белта 41 *ц/га* на пл. 70 *га*, у калгасе «Усход» (Уздзенскі р-н) — 33 *ц/га* на пл. 190 *га* (1970).



Каласы і зярняты азімага жыта Белта.

Каранёвая сістэма валасніковістая, сцябло — саломіна, лісце лінейнае. Суквецце — колас, які складаецца з двух-, радзей з трохкветкавых каласкоў. Кветкі двухполыя. Плод — зярнятка. Як культурная расліна Ж. вядомае з бронзавага веку, на тэр. Расіі вырошчвалі з 3 ст. да н. э. Пашырана ў Зах. Еўропе, часткова ў Амерыцы, Азіі, Афрыцы. У СССР вырошчваюць амаль усюды, асн. раёны пашырэння: ПнЗ і ПнУ Еўрап. часткі РСФСР, БССР, Прыбалтыка, Паволжа, вобласці цэнтральна-чарназёмнай зоны. У СССР плошча пасеваў на зерне 9993 тыс. *га*, у БССР 858,2 тыс. *га* (1970).


Літ.: Вавилов Н. И. О происхождении культурной ржи.— Новое звено в эволюции культурной ржи, Избр. труды, т. 3, М.—Л., 1962; Иванов А. П. Рожь, Л.— М., 1961; Тицунов А. Н., Глухих К. А. и Хорькова О. А. Озимая рожь, М., 1969; Мухін М. Д. Азімае жыта, Мн., 1969. *М. Дз. Мухін, Н. Ю. Сямёнава.* Жодзіна.


ЖЫТКАВІЦКІ РАЁН, у складзе Гомельскай вобл. Утвораны 17.7.1924. Размешчаны па З вобласці. Пл. 2,9 тыс. км². Нас. 60,0 тыс. чал. (1971). Падзяляецца на 12 сельсаветаў; 2 гар. пасёлкі: Жыткавічы — раённы цэнтр, Тураў.

Раён размешчаны на тэр. Прыпяцкага Палесся — вял. нізіннай раўніне (выш. 140—150 *м*). Уздоўж рэк шмат пясчаных узгоркаў і дзюн. Карысныя выкапні: радовішча гаручых сланцаў Тураўскае (частка радовішча ў Столінскім р-не) — 1181 млн. *т*; радовішча бурага вугалю — 25 млн. *т*; радовішча буд. каменю Жыткавічы — 159,5 млн. *м*³; 6 радовішчаў торфу з запасамі 126,7 млн. *т*, у т. л. радовішчы Булеў Мох — 52,6 млн. *т*, Межч — 46,4 млн. *т* і Ржышча-Ліпкі — 15,2 млн. *т*; 3 радовішчы кааліну — 17,7 млн. *т*, у т. л. радовішчы Дзедаўка — 8,5 млн. *т* і Бярэзіна — 7,7 млн. *т*; 4 невялікія радовішчы цагельнай сыравіны — 0,38 млн. *м*³, у т. л. радовішча Загрэбля — 0,25 млн. *м*³. Сярэдняя т-ра студз. —5,9, ліп. 18,4 °С. Ападкаў 584 *мм* за год. Вегет. перыяд 197 дзён. Рэкі — Прыпяць з прытокамі Сцвіга, Свінавод (справа), Случ, Скрыпіца, Навуць (злева). Найбольшае гасп. значэнне мае Прыпяць, якая ўваходзіць у сістэму Дняпроўска-Бугскага воднага шляху. На ПнУ — воз. Чырвонае, на ПнЗ — Белае. Глебы с.-г. угоддзяў дзярновыя і дзярнова-карбанатныя (2,8%), дзярнова-падзолістыя (9,8%), дзярнова-падзолістыя забалачальныя (29,5%), дзярнова-балотныя (9,6%), тарфяна-балотныя (23,3%), алювіяльна-дзярновыя (25%). З мінер. глебаў 24,5% суглінкавых, 7 супясчаных, 68,5% пясчаных. Якасная ацэнка глебаў у балах: ворных зямель 41 (цана бала 0,31 *ц/га*), усіх с.-г. угоддзяў 32. Пад лесам 57,2% тэр. Пераважае хвоя, значныя плошчы займаюць бяроза, асіна, вольха, дуб, ясень, граб. У межах раёна частка *Прыпяцкага дзяржаўнага ландшафтна-гідралагічнага запаведніка*. Насяляюць раён беларусы, ёсць рускія, украінцы, яўрэі. Сярэдняя шчыльн. 20 чал. на 1 км². Гарадскога насельніцтва 20,2%.

Прамысловасць развіваецца на мясцовых прыродных рэсурсах і с.-г. сыравіне: торфазаводы «Рудня-Грэбень», «Чырвонае», лясгасы і леспрамгасы ў Жыткавічах і Хваенску, маслазавод і камбінат быт. абслугоўвання ў Жыткавічах, пладова-агародніннны з-д і прам. камбінат у Тураве; у Жыткавічах і ў Тураве аб'яднанні Сельгастэхнікі; рыбгасы «Чырвоная зорка» і «Белае». У раёне 18 калгасаў і 4 саўгасы (1971).

Рыбная гаспадарка «Белае». Адпраўка жывой рыбы спажыўцам.





Калгасы і іх цэнтры: «XX парта'езд» *(Града)*, імя XXII з'езду КПСС *(Рычоў)*, «Дзень ураджаю» *(Хваенск)*, «2-я пяцігодка» *(Вятчын)*, імя Жданава *(Верасніца)*, «Запаветы Леніна» *(Кольна)*, «Зара» *(Пухавічы)*, імя Калініна *(Старажоўцы)*, «Кастрычнік» *(Дзякавічы)*, імя Куйбышава *(Чарацянка)*, імя Леніна *(Марохарава)*, «Ленінскі шлях» *(Хлупін)*, «Новае жыццё» *(Тураў)*, «Перамога» *(Запясочча)*, «Савецкая Беларусь» *(Знаменка)*, «3-і Інтэрнацыянал» *(Бялёў)*, «Чырвоны Кастрычнік» *(Пераród)*, «Шлях да камунізма» *(Хільчыцы)*. Саўгасы і іх цэнтры: «Жыткавічы» *(Жыткавічы)*, «Ленінскі» *(Леніна)*, «Людзяневічы» *(Людзяневічы)*, «Случ» *(Мілевічы)*.

С. гасп. спецыялізуецца на вытворчасці малака, мяса, ільновалакна. Пад с.-г. ўгоддзямі 25,6% тэр. На пач. 1971 асушана 23,9 тыс. *га* балотаў і забалочаных зямель. Агульная пасяўная пл. (тыс. *га*, 1970) 31,5, у т. л. пад збожжавымі і зернебабовымі (жыта, пшаніца, ячмень, авёс, грэчка і інш.) 11,9, тэхнічнымі (лён-даўгунец) 1, бульбай 6,6, кармавымі культурамі 11,7. На пач. 1971 было (тыс. галоў): буйн. раг. жывёлы 47 (у т. л. кароў 22), свіней 25,2, авечак і коз 4,3. Асн. віды транспарту чыгуначны і аўтамабільны. Чыгунка Гомель — Брэст. Аўтамаб. дарогі Калінкавічы — Лунінец, Слуцк — Мікашэвічы. Суднаходства на Прыпяці, сплаў лесу па Сцвізе і Случы.

У 1971 у раёне было 18 сярэдніх, 21 васьмігадовая, 56 пач. школ, 3 школы рабочай моладзі, сельскае прафес.-тэхн. вуч., 48 клубных устаноў, 66 масавых б-к, 51 кінаўстаноўка (у т. л. 36 стацыянарных), 7 бальніц, 32 фельч.-ак. пункты, 3 урачэбныя амбулаторыі. На пач. 1971 працавала 799 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, у т. л. 85 інжынераў, 33 аграномы, 17 заатэхнікаў, 19 вет. урачоў, 24 эканамісты, 543 настаўнікі, 42 урачы і інш.; 1288 чал. з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Раённая газета «Новае Палессе».

І. І. Трухан. Мінск.

ЖЫТКАВІЧЫ, гар. пасёлак (з 1938), цэнтр Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Чыг. ст. на лініі Гомель — Лунінец. За 238 *км* на З ад Гомеля. 7,9 тыс. ж. (1971). Маслазавод, раённае аб'яднанне Сельгастэхнікі, камбінат быт. абслугоўвання, леспрамгас, лясгас. 2 сярэднія і 2 васьмігадовыя школы, школа рабочай моладзі, завочная, музычная і дзіцячая спарт. школы, сельскае прафес.-тэхн. вуч. 3 дзіцячыя сады, яслі, Дом піянераў, Дом культуры, кінатэатр, 2 масавыя б-кі, бальніца, гісторыка-краязнаўчы музей. Помнік У. І. Леніну. Помнік воінам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



Жыткавічы. Плошча імя Леніна.

ЖЫТЛІН, вёска ў Іванцэвіцкім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на Пд ад Іванцэвіч, 158 *км* ад Брэста. 285 ж., гасп. 94 (1971). Лясніцтва. Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. 14.3.1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, помнік на брацкай магіле 80 савецкіх воінаў і партызанаў Айчыннай вайны.

ЖЫТНЯК, падрод злакаў з роду *пырнік*.


ЖЫТНЯЯ БАБА, вобраз стараж. беларускай міфалогіі, маці жыта, жаночая паралель «гаспадара» поля — *жыценя*.

Уяўлялася ў выглядзе фантаст. жанчыны з каласамі над галавой і зоркамі на баках. Водгук старадаўняга веравання — у абрадзе апошняга снапа, які ў некат. мясцінах называлі «бабаю», апраналі ў спадніцу, павязвалі хустку.

Літ.: Нікольскі Н. М. Міфалогія і абрадавасць валачобных песень, Мн., 1931.

ЖЫТОМІР, горад, цэнтр Жытомірскай вобл. УССР, на р. Цецераў (прыток Дняпра). Вузел чыг. і шашэйных дарог, аэрапорт. 161 тыс. ж. (1970). Прамысловасць дрэваапр. (мэблевы камбінат, ф-кі муз. інструментаў і папяровая), харчовая (мяса- і мукамольны камбінаты, лікёра-гарэлачны з-д), вытвор-

Уборка кукурузы на сілас у калгасе «3-і Інтэрнацыянал».




часць буд. матэрыялаў (з-ды буд. дэталяў і сілікатных панеляў), металаапр. (з-ды торарамонтны, «Электравымяральнік», «Шчытаўтаматыка», механічны), лёгкая (ільнокамбінат, абутковая, панчошная, швейная ф-кі). С.-г. і пед. ін-ты, агульнатэхн. ф-т Кіеўскага політэхн. ін-та, 10 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Тэатр, філармонія. Краязнаўчы музей.

Упершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых часоў» пад 1240. З 1320 у складзе Вял. кн. Літоўскага, з 1569 — Рэчы Паспалітай. З 1793 у складзе Рас. імперыі, цэнтр павета, з 1804 цэнтр Валынскай губ. Сав. ўлада устаноўлена 9(22).1.1918. У грамадз. вайну Ж. займалі пятлюраўцы, дзянікінцы, войскі бурж. Польшчы. Канчаткова вызвалены ў чэрв. 1920. З 1937 цэнтр Жытомірскай вобл. У Вял. Айч. вайну акупаваны ням.-фаш. захопнікамі (9.7.1941—31.12.1943). Радзіма пісьменніка У. Г. Караленкі, польскага рэвалюцыянера Я. Дамброўскага.

Літ.: Сипянов Г. Г. Житомир. Историко-архитектурний парис, Київ, 1968.

ЖЫТОМІРСКАЯ ВОБЛАСЦЬ, у складзе УССР. Утворана 22.9.1937. Пл. 29,9 тыс. *км*². Нас. 1626 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 22 раёны; 8 гарадоў, 36 гар. пас. Цэнтр г. Жытомір.



Паўн. і паўн.-ўсх. часткі Ж. в. займае Палеская нізіна і Оўруцкае ўзв. выш. да 316 *м*, на Пд і Пдз Прыдняпроўскае ўзв. выш. да 253 *м*. Карысныя выкапні: граніты, гнейсы, лабрадарыты, мармур, вапняк, гліны, жал. і тытанавая руды, буры вугаль, торф. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. —5,6, ліп. 18,7 °С. Ападкаў 500—600 *мм* за год. Вегет. перыяд 180 дзён. Рэкі належаць да бас. Дняпра. Прытокі Дняпра: Цецераў, Ірпень; прытокі Прыпяці: Случ, Убарць, Уж з прытокам Жэраў. Глебы ў паўн. лесастэпавай зоне малагумусныя чарназёмы і шэрыя лясныя, у паўночнай — дзярнова-падзолістыя, балотныя і шэрыя лясныя. Пад лесам і хмызнякамі каля 33% тэр. Асн. насельніцтва украінцы (84,5%), жывуць палякі, рускія, беларусы. Сярэдняя шчыльн. 54,4 чал. на 1 *км*². Гарадскога насельніцтва 35% (1970). Гарады: Жытомір, Бярдзічаў, Карасцень, Наваград-Валынскі, Карастышаў, Радамышль, Малін, Оўруч.

Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці павялічылася ў 1970 у параўнанні з 1940 у 7,8 раза. Найбольш развіта прамысловасць харч., лёгкая, маш.-буд., металаапр., дрэваапр., фарфора-фаянсавая, папяровая і буд. матэрыялаў. У харч. прамысловасці выдзяляюцца цукровая, малочная, мукамольная, спірта-гарэлачная, піваварная, масларобчая і плодакансервавая. Прадпрыемствы пераважна ў гарадах і ў Андрушэўскім, Лугінскім, Любарскім, Ружынскім, Чуднаўскім раёнах. Найб. прадпрыемства лёгкай прамысл.— ільнокамбінат у Жытоміры. Швейныя (Жытомір, Карасцень, Бярдзічаў, Наваград-Валынскі), тэкст. (Валадарск-Валынскі, Ямільчына), гарбарныя і абутковыя (Бярдзічаў, Жытомір) прадпрыемствы. Маш.-буд. і металаапр. прадпрыемствы выпускаюць эл. прылады, аўтазапчасткі (Жытомір), абсталяванне для хім. прадпрыемстваў і станкабудавання (Бярдзічаў, Карасцень), с.-г. машыны (Наваград-Валынскі). Прамысловасць буд. м. пераважна ў Карасценскім і Оўруцкім р-нах. Фарфора-фаянсавыя з-ды ў Гарадніцы, Карасцені, Баранаўцы, Доўбышы. 4 шклозаводы і 5 папяровых ф-к. Дрэваапр. прамысловасць у Жытоміры, Карасцені, Маліне. Здабыча і абагачэнне тытанавай руды (камбінат у Іршанску). С. гасп. спецыялізуецца ў паўн. ч. на вырошчванні лёну, бульбы, збожжа, у паўд. ч.— цукр. буракоў і пшаніцы. Жывёлагадоўля малочна-мяснога кірунку. На пач. 1971 у Ж. в. 619 калгасаў і 21 саўгас. Пасяўная плошча ўсіх с.-г. культур у 1970 (тыс. *га*) 1229,7, з іх пад збожжавымі 518,0, тэхн. 117,1, агародніна-бахчавымі і бульбай 178,8, кармавымі 415,8. Асн. збожжавыя культуры пшаніца (190,1 тыс. *га*) і жыта (136,6 тыс. *га*). З тэхн.— лён-даўгунец (61,7 тыс. *га*) і цукр. буракі (51,6 тыс. *га*). На 1.1. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 958,1 (у т. л. кароў 444,3), свіней 572,2, авечак і коз 213,3. Даўж. чыгунак 1101 *км* (1971). Асн. чыг. магістралі: Кіеў — Жытомір — Львоў, Адэса — Бярдзічаў — Ленінград. Шашэйных дарог 13,8 тыс. *км*, у т. л. з цв. пакрыццём 4,4 тыс. *км*. 2 пед. і с.-г. ін-ты, агульнатэхн. ф-т Кіеўскага політэхн. ін-та, 20 сярэдніх спец. навуч. устаноў. 2 тэатры (муз.-драм. і лялечны), філармонія. Дом-музей партыз. славы, мемарыяльны музей Лесі Украінкі. Абл. газета «Радянська Житомирщина». *В. П. Рудзянка.* Кіеў.

ЖЫТОМЛЯ, вёска ў Гродзенскім р-не. Цэнтр сельсавета і калгаса «Гвардыя». За 20 *км* на ПдУ ад Гродна, 1 *км* ад чыг. ст. Жыдомля, каля шашы Гродна — Ліда (3 *км*). 675 ж., гасп. 222 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік 27 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЖБІЎКАЎ Тодар (н. 7.9.1911, в. Правец Бопеўградскай акалі), дзеяч балгарскага рабочага руху, паліт. і дзярж. дзеяч Народнай Рэспублікі Балгарыі (НРБ). З беднай сялянскай сям'і. У 1929—39 працаваў друкаром. З 1930 чл. Балг. камуніст. саюза моладзі. З 1932 чл. Балгарскай кампартыі (БКП). Працаваў на адказных пасадах у парт. і прафс. арг-цыях Сафіі. У 2-ю сусв. вайну адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху супраць ням.-фаш. акупантаў і іх памагатых у Балгарыі. З 1945 канд. у чл. ЦК, з 1948 чл. ЦК БКП. Сакратар Сафійскага гаркома БКП (1948—49). З 1950 канд. у чл. Палітбюро і сакратар ЦК БКП, з 1951 чл. Палітбюро. З 1954 першы сакратар ЦК БКП, адначасова: у 1962—71 старшыня Савета Міністраў, в 1971 старшыня Дзярж. савета НРБ. Узначальваў дэлегацыі БКП на XXI—XXIV з'ездах КПСС і на міжнар. нарадах камуніст. і рабочых партый у Маскве 1957, 1960 і 1969. У 1961 наведаў Беларусь. Узнаг. ордэнам Леніна.



Тв.: Рус. пер.— Избр. статьи и речи, т. 1—2, М., 1964—65; Об интенсивном развитии социалистической экономики в Народной Республике Болгарии, М., 1967.

ЖЫЎЛЕ́ННЕ РАСЛІ́Н, працэс паглынання і засваення пажыўных рэчываў раслінамі, састаўная частка абмену рэчываў. Паводле тыпу жыўлення расліны падзяляюцца на аўтатрофныя — самі сінтэзуюць арган. рэчывы (вышэйшыя расліны, водарасці, некат. бактэрыі) і гетэратрофныя — выкарыстоўваюць гатовыя арган. рэчывы (грыбы, большасць бактэрый). Рэзкай мяжы паміж аўтатрофамі і гетэратрофамі няма: зялёныя расліны могуць засвойваць арган. рэчывы (амінакіслоты і інш.), а некат. расліны в розным тыпам жыўлення іспыюць у *сімбіёзе*. Вышэйшыя расліны засвойваюць лісцем вуглякіслы газ з паветра (гл. *Фотасінтэз*), паглынаюць каранёвай сістэмай з глебы ваду (гл. *Водны рэжым раслін*) і растваныя ў ёй мінер. солі. Засваенне пажыўных рэчываў з глебы цесна звязана з фотасінтэзам і дыханнем: інтэнсіўнасць паглынання мінер. рэчываў клеткай каранёвага валаска залежыць ад энергіі дыхання, а для дыхання каранёў патрэбны прадукты фотасінтэзу.

Аснова пач. ступеняў засваення раслінай пажыўных рэчываў з глебы — абменная адсорбцыя іонаў (у абмен на выдзеленыя раслінай пры дыханні іоны вадароду — H^+ і гідракарбанату — HCO_3^- паглынаюцца з вонкавага асяроддзя паўныя катыёны і аніёны пажыўных рэчываў). Пач. засваенне пажыўных рэчываў — фізіка-хім. працэс звязвання іонаў паверхняй слізістай клетачнай абалонкі каранёвых валасконаў. Клетачная абалонка мае выбіральную пранікальнасць. Элементы жыўлення, якія трапілі ў клетку, удзельнічаюць у фізіял. працэсах, у выніку расліна развіваецца і расце. З мінер. рэчываў раслінам патрэбны макраэлементы (азот, фосфар, сера, калій, магній, кальцый, жалеза), мікраэлементы (бор, кобальт, марганец, медзь, малібдэн, цынк і інш.). Вызначана роля асобных элементаў для жыццядзейнасці раслін. Азот уваходзіць у састаў бялкоў, нуклеінавых к-т, хларафілу, вітамінаў і інш. Фосфар — састаўная частка нуклеінавых к-т, ферментаў, фосфарных эфіраў цукроў і інш. Калій (у іонавай форме) падтрымлівае спрыяльны для жыццёвых функцый клеткі фізіка-хім. стан ля структурных кампанентаў, садзейнічае сінтэзу вугляводаў. Кальцый — неабходная састаўная частка пратаплазмы. Ён узмацніе абмен рэчываў, садзейнічае фарміраванню клетачных абалонак. Магній уваходзіць у састаў хларафілу, некат. ферментаў; мае значэнне для абмену рэчываў клеткі. Сера — састаўная частка большасці бялкоў, некат. амінакіслот (цыстэіну, метыяніну). Жалеза ёсць у саставе ферментаў, якія актывізуе дыханне, акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі, сінтэз вугляводаў, тлустых к-т. Каб вызначыць, якія элементы мінер. жыўлення патрэбны раслінам, выкарыстоўваюць вегет. метад: вырошчваюць расліны ў спец. пабудовах у пасудзінах з глебай (глебавыя культуры), з кварцавым пяском (пясчаныя культуры), з дыстыляванай вадой (водныя культуры) і інш. на адмысловым пажыўным асяроддзі. Калі неабходна даследаваць рост і Ж. р. пры адсутнасці мікраарганізмаў, выкарыстоўваюць стэрыльныя культуры. На Беларусі пытанні мінер. Ж. р. даследуюцца ў Ін-це эксперым. батанікі АН БССР, Бел. НДІ земляробства, Бел. НДІ глебазнаўства і аграхіміі і інш.

Літ.: Прянишников Д. Н. Избр. соч., т. 2, М., 1953; Сабинин Д. А. Физиологические основы питания растений, М., 1955; Саляев Р. К. Поглощение веществ растительной клеткой, М., 1969; Терентьев В. М. Особенности физиологии роста хлебных злаков на торфяной почве, Мн., 1970. *В. М. Цярэнцьеў, Р. І. Царова.* Мінск.

ЖЫЦЕНЬ (палявік), вобраз стараж. беларускай міфалогіі, «гаспадар» поля. Яго жаночая паралель — *жытняя баба.*

Уяўляўся як маленькі дзядок з доўгай барадою, што нібыта меў уплыў на ўраджай. Лічылася, што Ж. збірае каласы на ніве нядбайнай гаспадыні, якая не чыста жне, і пераносіць іх на поле руплівай жняі. Паважаўся як дух багацця і дабрабыту (багач, спарыш, рай). Пазней зліўся з уяўленнем пра бога як вытворцу збожжа. Падобныя міфалагістоты вядомыя рускім, літоўцам, латышам, палякам, чэхам.

Літ.: Нікольскі Н. М. Міфалогія і абрадавасць валачобных песень, Мн., 1931.

ЖЫЦІ (агіяграфія), від рэлігійнабіягр. літаратуры пра жыццё духоўных і свецкіх асоб, кананізаваных хрысц. царквою.

Узніклі ў Рымскай імперыі. Вылучаюцца 3 тыпы зборнікаў Ж.— «Чэцці Мінеі» (месячныя чытанні), самыя вялікія; «Пралогі» (самыя кароткія); «Пацерыкі» (размешчаныя выбарачна). Адэін в асн. відаў чытання і літ. творчасці ў сярэднія вякі. У Кіеўскай Русі пасля прыняцця хрысціянства былі вядомыя перакладныя Ж. (Антонія Вялікага, Андрэя Юродзівага, Васіля Новага і інш.), якія

сталі крыніцаю шэрагу легендаў, *духоўных вершаў*, нар. драм; арыгінальныя Ж. перших рускіх «святых» (князёў Вольгі, Уладзіміра, Барыса і Глеба і інш.). Маюць пазнавальнае значэнне, у іх ёсць гістар. матэрыял, у паасобных — сцэнкі з нар. побыту. Шырока бытавалі ў рус. л-ры да канца 17 ст.

Арыгінальныя бел. Ж. вядомыя ад 12—13 ст. («Жыціе Ефрасінні Полацкай», «Жыціе Аўрамія Смаленскага»), в перакладных былі папулярныя «Жыціе Аляксея, чалавека божага», «Сказанне пра віленскіх пакутнікаў» (не пазней 15 ст.), а таксама з кнігі П. Скаргі (Вільня, 1579).

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968; Кадлубовский А. Очерки по истории древнерусской литературы житий святых, [ч.] 1—5, Варшава, 1902; Гудзий Н. К. Переводы «Żywotów świętych» Петра Скарги в Юго-Западной Руси, Киев, 1917; Лихачев Д. С. Человек в литературе Древней Руси, М., 1970.
М. І. Прашковіч. Мінск.

ЖЫЦІК (Lolium), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. злакавых. Вядома каля 20 відаў, пашыраных у Еўропе, Афрыцы, ва ўмеранай зоне Азіі, занесены ў Паўн. Амерыку і Аўстралію. У СССР 9 відаў, на Беларусі 4.



Жыцік шматгадовы: *1* — сцябло з каранёвай сістэмай; *2* — колас.

Сцябло выш. да 1 *м*. Каласкі шматкветныя, сціснутыя з бакоў, сядзяць па адным на выступах восі коласа. На Беларусі пайб. вядомыя Ж. шматгадовы, англійскі райграс (L. perenne, нар. назва жывіца), уведзены ў культуру як кармавая расліна (гл. *Райграсы*), Ж. п'янючы (L. temulentum, нар. назвы: галавіца, жыцец) і Ж. лёнавы (L. linicola, нар. назвы: жытвіца, дурнап'ян) — пустазелле, засмечваюць пасевы збожжавых, люцэрны, лёну. Зярняўкі Ж. п'янючага небяспечныя для людзей і жывёлы з-за атрутнага грыба Stromatina temulenta, які развіваецца пад лускою. Меры барацьбы: ачыстка насення, лушчэнне ржышча, ранняе зяблевае ворыва.

Літ.: Котт С. А. Сорные растения и борьба с ними, М., 1969.

ЖЫЦІН, вёска ў Дрычынскім с/с Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр калгаса імя Чарняхоўскага. За 44 *км* на ПдЗ ад Асіповіч, 177 *км* ад Магілёва, 21 *км* ад чыг. ст. Фалічы. 228 ж., двароў 85 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ЖЫЦЦЁ, асаблівая, найвышэйшая форма існавання матэрыі, якая ўзнікае на пэўным этапе яе эвалюцыйнага развіцця. На Зямлі існуе многа разнастайных формаў жыцця — *вірусы, мікраарганізмы, расліны, жывёлы, чалавек*. Жывыя арганізмы пабудаваны з клетак (гл. *Клетка*). Кожны арганізм, нават в адной жывой клетцы — складаная адкрытая сістэма, якая можа існаваць толькі пры пастаянным самаўзнаўленні і абмене рэчывам і энергіяй з навакольным асяроддзем. Праблема сутнасці Ж. заўсёды была ў цэнтры барацьбы матэрыялізму і ідэалізму. Ідэалісты лічаць, што ўзнікненне Ж. абумоўлена нематэрыяльнымі фактарамі, выяўленнем «душы», «сусветнага духу», «жыццёвай сілы» і інш. (гл. *Віталізм, Тэлеалогія*). Дыялект. матэрыялізм, апіраючыся на дасягненні прыродазнаўства, даказаў, што Ж. з'яўляецца матэрыяльным працэсам, які мае якасныя, спецыфічныя асаблівасці. «Жыццё — гэта спосаб існавання бялковых цел, істотным момантам якога з'яўляецца пастаянны абмен рэчываў з акружаючай іх знешняй прыродай...» (Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954, с. 236).

Ж., па тэорыі А. І. Апарына, узнікла ў сусв. акіяне ў далёкія геал. эпохі (1,5—2 млрд. гадоў назад), калі на зямлі была высокая тэмпература, а атмасферу, якая складалася з вадзяной пары, метану, аміяку і інш. газаў, пранізвалі інтэнсіўная сонечная радыяцыя і каск. прамяні. У гэтых умовах маглі ўтварацца малекулы арган. рэчываў, якія паступова ўскладняліся і адасабляліся ад навакольнага асяроддзя, утвараючы першасныя каацэрватныя кроплі, або манеры. За сотні млн. гадоў з іх узніклі прасцейшыя істоты, якія ўжо мелі асн. асаблівасці Ж.— абмен рэчываў, самаўзнаўленне і раздражняльнасць. Далейшая эвалюцыя мела ў сваёй аснове натуральны адбор, які пры наяўнасці здольнасці арганізмаў да размнажэння, спадчыннасці і зменлівасці забяспечваў выжыванне формаў, найб. прыстасаваных да пэўных умоў (гл. *Дарвінізм*).

Развіццё хіміі і малекулярнай біялогіі пацвердзіла вывады Энгельса і паказвае, што бялкі і *нуклеінавыя кіслоты* забяспечваюць абмен рэчываў і працэсы самаўзнаўлення, што з імі звязаны, здольнасць жывога размнажацца і развівацца (уласцівасці спадчыннасці і зменлівасці). Ж. ў насенні, спорах і інш. формах знаходзіцца ў скрытым стане — *анабіёзе*, пры якім асн. яго ўласцівасці не выяўляюцца. Структура жывых сістэм з'яўляецца складанай на ўсіх узроўнях арганізацыі — ад арган. малекул (перш-наперш макрамалекул) і клетачных арганел (рыбасом, мітахондрый і інш.) да клетак, тканак і цэласных высокаарганізаваных арганізмаў — раслін, жывёл, чалавека. Гэтыя складаныя структуры ўтвораны з элементаў, якія ўваходзяць у склад і нежывой прыроды. Аснoўныя з іх: вуглярод, кісларод, вадарод, азот (складаюць 98% масы арганізмаў), сера, фосфар, жалеза і інш.; яны выконваюць пэўную ролю ў працэсе жыццядзейнасці. У розных жывых арганізмах выяўлены амаль усе элементы, якія ёсць у неарганічнай прыродзе, але ў інш. колькасцях, у складзе іншых спецыфічных для арганізмаў злучэнняў. Асаблівае значэнне для Ж. на Зямлі мае вуглярод, здольны ўтвараць доўгія ланцужкі атамаў — аснову арган. малекул. Асн. макрамалекулы жывых арганізмаў — бялкі і нуклеінавыя кіслоты — здольны самаўзнаўляцца шляхам матрычнага сінтэзу, які ніколі не адбываецца ў нежывой прыродзе. Пры гэтым малекулы бялкоў будуюцца з амінакіслот, якія ёсць у клетцы, а малекулы нуклеінавых кіслот — з нуклеатыдаў такім чынам, што ў новай малекуле яны размяшчаюцца на плане, адпаведным структуры папярэдняй малекулы. Адкрыццё матрычнага сінтэзу *дэзоксірыбануклеінавай кіслаты*, у якой запісана генетычная інфармацыя, растлумачыла механізм спадчыннасці. Матрычны сінтэз бялкоў, перш за ўсё бялкоў-ферментаў, забяспечвае арганізаваную ў часе і прасторы паслядоўнасць хім. рэакцый, якія з'яўляюцца абменам рэчываў і ляжаць у аснове ўсіх біял. функцый. У гэтых працэсе аб'яднаны паток рэчываў і паток інфармацыі. Асн. структура бялкоў і нуклеінавых кіслот агульная ва ўсіх арганізмаў, аднак надзвычайная складанасць малекул гэтых рэчываў (у іх увахо-дзяць дзесяткі і сотні тыс. атамаў) дае магчымасць неабмежаванай колькасці варыянтаў будовы, якія забяспечваюць многастайнасць жывых істот. Энергетыцы Ж. таксама характэрна многастайнасць трансфармацыі энергіі пры агульнасці асн. заканамернасцей. Першасная крыніца энергіі для ўсіх арганізмаў, акрамя хемасінтэзавальных бактэрый,— энергія сонечнага святла, акумуляванай раслінамі (гл. *Фотасінтэз*). Але асн. непасрэдная крыніца энергіі ў розных працэсах жыццядзейнасці ўсіх арганізмаў — багатыя энергіяй фосфарныя злучэнні, пераважна *адэназінтрыфосфарная кіслата*.

Літ.: Энгельс Ф. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Опарин А. И. Происхождение жизни, М., 1967; Волкенштейн М. В. Молекулы и жизнь, М., 1965; Бернал Д. Возникновение жизни, пер. с англ., М., 1969; Энгельгардт В. А. Проблема жизни в современном естествознании, «Коммунист», 1969, № 3; Костюк Н. Т. О сущности жизни, Киев, 1967; Веселовский Н. В. О сущности живого, М., 1971.
С. П. Ландау-Тыліна. Масква.

«ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУСА», газета рэвалюц.-дэмакратычнага кірунку, орган сеймавага пасольскага клуба *Беларускай сялянска-рабочай грамады* (БСРГ). Выдавалася з 19.8 да 12.11.1925 у Вільні тры разы на тыдзень на бел. мове. Абараняла інтарэсы працоўных Зах. Беларусі, заклікала рабочых і сялян да барацьбы за сац. і нац. правы, патрабавала 8-гадзіннага рабочага дня, перадачы абшарніцкай зямлі беззямельным і малазямельным сялянам. Пісала пра цяжкае жыццё працоўных Зах. Беларусі, судовыя расправы над камуністамі і прагрэс. дзеячамі Зах. Беларусі і Зах. Украіны, пра дзейнасць *Таварыства беларускай школы*. Змяшчала артыкулы пра дасягненні Сав. Беларусі. Выйшла 20 нумароў, № 2, 7, 14, 15 і 19-ы канфіскаваныя. Закрыта польскімі ўладамі. Выдала адзін нумар дадатку «Сельскагаспадарчы аддзел».
Н. А. Ляшковіч. Вільнюс.

ЖЫЧКА Хведар Дзмітрыевіч (н. 20.3.1927, в. Марс Жлобінскага р-на Бабруйскай акругі), беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1969. З сялян. У 1944—51 служыў на Балт. флоце. Потым працаваў у рэсп. газетах і часопісах. У 1959 скончыў Літ. ін-т імя М. Горкага. З 1960 у выд-ве «Беларусь». Друкуецца з 1947. Першы аб. вершаў «Стой на вахце, сэрца» (1961). Тэмы воінскага абавязку, рамантыкі марской службы, маральнай чысціні, хараства роднай прыроды — аспоўныя ў паэзіі Ж. Ёй уласцівыя эмацыян. стрыманасць, традыц. вобразна-выяўленчыя сродкі. Цікавасць да станаўлення характару юнага героя — галоўнае ў творах для дзяцей (аповесць пра Айч. вайну «Зброю бяруць сыны», 1964, і інш.). Пераклі на бел. мову творы А. Міцкевіча, І. Франка, Лесі Украінкі, Я. Райніса, М. Ціханава і інш.

Тв.: Каштанавы «Масквіч», Мн., 1959; Піфагоравы штаны, Мн., 1961; Мы будзем жыць у вёсцы Сонечнай, Мн., 1963; Росныя лілеі, Мн., 1965; Пасцелі суніцы, Мн., 1966; Дзе растуць бессмертнікі, Мн., 1967; Настой, Мн., 1968; Букет вярбіняў, Мн., 1970; Мая вуліца, Мн., 1970; Мае тэмы, у кн.: Пра час і пра слабе, Мн., 1966.
Л. А. Лойка. Мінск.

ЖЭБЕЛЕЎ Сяргей Аляксандравіч (10.9.1867—28.12.1941), савецкі гісторык антычнасці і археолаг. Акад. (1927). У 1890 скончыў гісторыка-філал. ф-т Пецярбургскага ун-та. Напісаў каля 300 прац па гісторыі Грэцыі эліністычнага і рым. перыядаў і Паўн. Прычарнамор'я антычнай эпохі, а таксама перакладаў антычных аўтараў (Арыстоцеля, Платона, Апіяна).

Літ.: Толстой И. Академик С. А. Жебелев в развитии русской историографии по античности, «Вестник древней истории», 1940, № 1; Калистов Д. Роль акад. С. А. Жебелева в исследовании северного Причерноморья античного времени, там жа; Биография академика С. А. Жебелева и список его печатных трудов, там жа; Сергей Александрович Жебелев (1867—1941). [Некралог], там жа, 1946, № 1.

ЖЭБРАК Антон Раманавіч [27.12.1901(9.1.1902), в. Збляны Гродзенскай губ.— 20.5.1965], беларускі савецкі батанік, генетык, селекцыянер і грамадскі дзеяч. Акад. АН БССР (1940). Засл. дз. н. БССР (1944). Чл. КПСС з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў Маскоўскую с.-г. акадэмію імя Ціміразева (1925), ін-т чырвонай прафесуры (1929). Праф. генетыкі і селекцыі Акадэміі сацыяліств. земляробства ў Маскве (1931—36), заг. кафедры генетыкі і селекцыі с.-г. акадэміі імя Ціміразева (1934—48). У 1947 прэзідэнт АН БССР. З 1949 заг. кафедры батанікі Маскоўскага мед. ін-та. Навук. працы па тэарэт. пытаннях генетыкі, міжвідавой гібрыдызацыі пшаніцы і грэчкі. Атрымаў новыя, паліплоідныя віды пшаніцы з 42, 56 і 70 храмасомамі, тэтраплоідныя і амфідыплоідныя віды грэчкі. Кіраваў працамі па эксперым. поліплаідыі ў Ін-це біялогіі АН БССР (1953—62), у Ін-це генетыкі і цыталогіі АН БССР (1962—65). У 1945 чл. дэлегацыі БССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска (ЗША), дзе з інш. ўдзельнікамі падпісаў Статут ААН. Дэп. Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Категории генетики в свете диалектического материализма, «Социалистическая реконструкция сельского хозяйства», 1936, № 12; Полиплоидные виды пшеницы, М., 1957; Новый сорт гречки для БССР, «Весці АН БССР. Сер. біялагічных навук», 1959, № 3.

Літ.: Антон Романович Жебрак, «Генетика», 1965, № 2.

ЖЭЛЬЦЫ, возера ў бас. р. Сосніцы, правага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,83 *км²*. Даўж. 1,8 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя каля 0,5 *км*. Катлавіна выцягнута з ПнУ на ПдЗ. Паўн.-зах. схіл высокі і стромкі, паўд.-ўсходні спадзісты з забалочанымі берагамі. Вадазбор (63,8 *км²*) слабаўзгорысты, складзены з марэны, значна забалочаны. Возера праточнае: упадаюць пратокі з азёраў Няклея і Сіцепец; выцякае Жальцанка. Водзяцца плотка, акунь, лешч, шчупак, гусцяра, джгір, верхаводка, карась.

ЖЭМАЙТЫ (*жмудзь, жэмайчай*), літоўцы, якія жывуць у Жэмайціі — зах. часткі Літоўскай ССР, гавораць на адным з двух асноўных літ. дыялектаў. У 13—14 ст. вялі ба-

рацьбу супраць Тэўтонскага ордэна. Пасля Грунвальдскай бітвы 1410 і *Мельнскага дагавору 1422* — у Вял. кн. Літ.

Літ.: Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. М., 1959.

ЖЭМАЙТЭ (Zemaité) Юлія [сапр. Жыманцене; Žymantienė; 31.5(12.6).1845, маёнтак Букантэ Цельшаўскага пав. Ковенскай губ.— 8.12.1921], літоўская пісьменніца, прадстаўніца крытычнага рэалізму ў літоўскай л-ры. Са збяднелай дваранскай сям'і. Вітала дэмакр. ідэі паўстання 1863, памагала яго ўдзельнікам. Насуперак волі бацькоў выйшла замуж за былога прыгонпага, паўстанца 1863. Літ. дзейнасць пачала ў 1894 (апавяд. «Асеннім вечарам»). У апавяданнях і нарысах рэалістычна паказала цяжкае жыццё сялян, іх барацьбу з абшарнікамі, выступіла на абарону бяспраўнай жанчыны («Нявестка», 1896; «Пятрас Курмяліс», 1898; «Каля майптка», 1902). У многіх творах выкрывала духавенства, рэліг. забабоны («Ахвяра святому Юргісу», 1905; «На маленне ў Шыдлаву», 1907), бязду шнасць бюракратычна-паліцэйскай сістэмы («Зазнае вінаваты, зазнае і нявінны», 1907; «Злачынка», 1912). Пісала апавяданні для дзяцей, камедыі, фельетоны, публіцыст. артыкулы. Глыбокі дэмакратызм, яркія малюнкі сялянскага побыту, сакавітая нар. мова — асн. рысы твораў Ж. На бел. мову апавяд. Ж. «Нявестка» пераклаў Я. Скрыган.



Тв.: Raštai, t. 1—6, Vilnius, 1956—58; бел. пер.— у кн.: Літоўскія апавяданні, Мн., 1957; рус. пер.— Избр. соч., т. 1—2, М., 1951; Пойманный бес. Рассказы, М., 1961; Сноха. Рассказы, Вильнюс, 1966.

ЖЭМЧУГ (слова кіт. паходжання, франц. Perl), цвёрдыя шарападобныя ці няправільнай формы вылучэнні перламутравага рэчыва, якія развіваюцца ў ракавінах некат. малюскаў. Складзены пераважна з вугляк іслага кальцыю (араганіту). Колер разнастайны: жоўты, шэры, ружовы, чырванаваты, фіялетавы, чорны, найчасцей белы з жаўтаватым або блакітным адлівам. Бляск характэрны перламутравы. Памеры ад дробных зярнят да буйных гаротын (1—1,5 *см* у дыяметры). Трапляецца ў СССР (у рэках Кольскага п-ва, Валагодскай вобл. і інш.), у Бенгальскім, Персідскім заліве, у Чырвоным моры. Выро шчваюць і штучна. Выкарыстоўваецца на ўпрыгожванні.

ЖЭНЁВА (франц. Genève, ням. Genf), горад на З Швейцарыі, на беразе Жэнеўскага воз., каля вытоку р. Роны. Вузел чыг. і шашэйных дарог, аэрапорт. Адм. ц. кантона Жэнева. 307,5 тыс. ж. (з прыгарадамі, 1969). Металаапрацоўка, машынабудаванне, у т. л. вытворчасць дакладных металарэзаных станкоў, інструментаў і апаратаў. Вытворчасць гадзіннікаў і ювелірных вырабаў. Прадпрыемствы тэкст., швейнай, дрэваапр., папяровай, кандытарскай прамысловасці. Ун-т (засн. ў 1559), школа прыгожых і прыкладных мастацтваў, кансерваторыя. Тэатры. Публічная і універсітэцкая б-кі. Музеі (мастацтва і гісторыі, этнаграфіі, прыродазнаўства і інш.). Абсерваторыя, бат. сад. Адзін з цэнтраў турызму.

Упершыню Ж. ўпамінаецца ў 1 ст. да н. э. як кельцкае паселішча. У 5 ст. захоплена бургундамі. У 11 ст. ўвайшла ў «Свяшчэнную Рымскую імперыю». У ходзе барацьбы з герцагамі савойскімі далучылася да Швейц. саюза (пагадненне з Фрайбургам у 1519, з Бернам у 1526). У 16 ст. адзін з найважнейшых цэнтраў Рэфармацыі (у 1541—64 Ж. кіраваў Ж. *Кальвін*). У Ж. нарадзіўся Ж. Ж. Русо, жылі Вальтэр, Дж. Байран, Буніны. Цэнтр рэвалюц. эміграцыі (19 — пач. 20 ст.). У сак. 1870 у Ж. створана *Руская секцыя 1-га Інтэрнацыянала*, у 1883 — першая руская марксісцкая арг-цыя *група «Вызволение працы»*. У 1895, 1901, 1903—05, 1907—08 у Ж. жыў У. І. Ленін. Выдавалася (1903) газ. «Искра». Ж.— традыц. месца размяшчэння міжнар. арг-цый і склікання міжнар. нарад, канферэнцый.

Аблічча Ж. з ле рэгулярнай планіроўкай 19—20 ст. вызначаюць будынкі гатага часу, скверы, набярэжныя. У старой частцы Ж. (на левым беразе Роны) — сабор Сен-П'ер (пачаты ў 12 ст. ў раманскім стылі, у 13—15 ст. будаваўся ў гатычным стылі; класіцыстычны фасад, 1752—56), ц. Сент-Мары-Мадлен (14—15 ст.), ратуша (15—17 ст.), гатычныя, рэнесансавыя і класіцыстычныя жылыя дамы, палац Эйнар (1817—21). На правым беразе Роны, у новай частцы Ж. (са старым кварталам з ц. Сен-Жэрве, 15 ст.) — вакзал Карнавен (1928), палац Нацый (1937), індустр. раёны. У Ж.- Нац. помнік (1863—69), помнік Рэфармацыі (1909—17).

ЖЭНЕЎСКІЯ КАНВЁНЦЫІ, шматбаковыя міжнар. пагадненні пра абарону ахвяр вайны, заключаныя ў 1949 у Жэневе.

Прынята 4 канвенцыі: Канвенцыя аб паляпшэнні лёсу параненых і хворых у дзейных арміях (выпрацавана на аснове Ж. к. 1864, перагледжаных у 1906 і 1929); Канвенцыя аб паляпшэнні лёсу параненых, хворых і асоб з складу узброеных сіл на марах (выпрацавана на аснове Ж. к. 1929); Канвенцыя пра абарону ваеннапалонных (на аснове Гаагскай канвенцыі 1899 і Ж. к. 1929); Канвенцыя пра абыходжанне з ваеннапалонными (на аснове Ж. к. 1929); Канвенцыя пра абарону вольнага насельніцтва ў час вайны (дапоўніла 4-ю Гаагскую канвенцыю 1907 аб законах і звычаях вайны). Палажэнні Ж. к. не павінны парушацца таксама ў час калан. войнаў. Да Ж. к. далучылася больш за 110 дзяржаў, у т. л. СССР (ратыфікаваны БССР 5.6.1954).

Кр.: Женевские конвенции о защите жертв войны, М., 1954; Белорусская ССР в международных отношениях, Мн., 1960. *А. Е. Гурыновіч.* Мінск.

ЖЭНЕЎСКІЯ ПАГАДНЁННІ 1954 пра адналенне міру ў Індакітаі і ўладкаванне пал ітычных праблем у В'етнаме, Лаосе і Камбоджы. Падпісаны 20—21 ліп. на нарадзе ў Жэневе (удзельнічалі СССР, КНР, ДРВ, Вялікабрытанія, Камбоджа, Лаос, ЗША, Францыя і Паўд. В'етнам). Паводле пагадненняў спынена вайна, распаленая ў вер. 1945 франц. імперыялістамі ў Індакітаі; В'етнам, Лаос і Камбоджа не павінны былі ўдзельнічаць у ваен. саюзах. Удзельнікі нарады абавязаліся паважаць суверэнітэт, незалежнасць, адзінства і тэрытарыяльную цэласнасць В'етнама, Лаоса і Камбоджы, а таксама не ўмешвацца ў іх унутраныя справы. Заключную дэкларацыю, у якой выкладзены асн. палажэнні дасягнутай дамоўленасці, ухвалілі ўсе ўдзельнікі нарады, акрамя ЗША і Паўд. В'етнама. Амер. імперыялісты ў 1956 сарвалі выбары ў В'етнаме, якія павінны былі прывесці да аб'яднання краіны, усталявалі марыянетачны рэжым у Паўд. В'етнаме. Сваімі агрэс. дзеяннямі ЗША парушылі мір у Індакітаі, у 1961 распачалі неабвешчаную вайну супраць патрыят. сіл Паўд. В'етнама, у 1964—68 вялі паветр. вайну супраць ДРВ, у 1970 расшырылі агрэсію на ўсю тэр. Індакітая, імкнуцца ператварыць яго ў свой ваен.-стратэгічны плацдарм у Паўд.-Усх. Азіі.

ЖЭНЕЎСКІЯ ПРАТАКОЛЫ, міжнар. дакументы, прынятыя ў Жэневе ў 1922—25.

1) Пратакол 1922 аб пазыцы для Аўстрыі і аб забароне *аншлюса*. Падпісаны Аўстрыяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Італіяй, Чэхаславакіяй. Палажэнні пратакола дзейнічалі, пакуль Аўстрыю не акупавала фашысцкая Германія (1938); 2) Пратакол 1924 аб мірным вырашэнні міжнародных спрэчак. Прыняты Асамблеяй Лігі Нацый. Падпісаны 19 краінамі, аднак не набыў сілы, бо Англія і Італія адмовіліся падпісаць яго; 3) Пратакол 1925 аб забароне ужываць на вайне ўдушлівыя, ядавітыя або іншыя падобныя газы і бактэрыялагічныя сродкі. Падпісалі 37 краін. СССР далучыўся да яго ў 1927. ЗША, Японія і некат. інш. капіталіст. краіны пратакола не ратыфікавалі.

Кр.: Сборник документов по международной политике и международному праву, М., 1937; Законы и обычаи войны, М., 1942; 50 лет борьбы СССР за разоружение, М., 1967.

ЖЭЎНА, возера ў бас. Тураўлянкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,6 *км*². Даўж. 1,4 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. 25 *м*, сярэдняя 6,5 *м*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Схілы стромкія, выш. 15—20 *м*, на Пд укрыты лесам. Прыбярэжная зона пясчана-гліністая, з дробнай галькай; цэнтр. ч. дна зацягнута чорным ілам. Вадазбор (11,5 *км*²) буйнаўзгорысты і спадзіста-хвалісты. Ж. слаба праточнае: упадае пратока з воз. Лешна, сцёк у воз. Крывое. Водзяцца плотка, акунь, джгір, ліпь, карась, лязь і інш.

ЖЭНЬШЭНЬ (Panax), род шматгадовых травяністых раслін сям. араліевых. Відома 5 відаў, пашыраных на Усх. Азіі і Паўн. Амерыцы. Найб. значэнне мае Ж. кітайскі, «корань-чалавек» (P. ginseng).



Жэньшэнь кітайскі: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — тыпы каранёў.

Сцябло Ж. прамастойнае, уверсе з кальчаком доўгачаранковага пальчастага ліслі. Кветкі дробныя, сабраныя ў парасонкі. Плод — касцянка. Выш. Ж. кітайскага 30—70 *см*; корань стрыжнёвы, у верхняй частцы з паплрочна - маршчакаватым каронішчам, мясісты, духмяны, гаркавата-салодкі, формаю часта нагадвае постаць чалавека; кветкі белыя; касцянка ярка-чырвоная. Трапляецца у СССР (на Д. Усходзе), у Маньчжурыі, Кітаі, Карэі. Расце адзіночна, радзей групамі ў горных шыракаліста-хвойных і кедравых лясах. Жыве да 100 гадоў. Каштоўная лекавая расліна (вядома у кіт. медыцыне за 2800 г. да н. э.; да 19 ст. цанілася у 18 разоў даражэй за волата). У Ж. ёсць сапаніны і рэчывы, што дзейнічаюць як вітаміны і гармоны. Прэпараты з каранёў ужываюцца ў медыцыне як танізоўныя і стымулявальны сродкі. Яго культывуюць на плантацыях у СССР, Кітаі, Карэі, Амерыцы. На Беларусі Ж. вырошчваюць аматары, вядуцца доследы па шырокім культываванні.

Літ.: Брехман И. И. Женьшень, Л., 1957; Грушвицкий И. В. Женьшень, Владивосток, 1961; Атлас лекарственных растений СССР, М., 1962.

ЖЭОДА (франц. géode земляны), пустацелы жаўлак у горнай пародзе з друзамі крышталяў на сценках, незавершаная ў сваім развіцці *сакрэцыя*. Узнікае ў пустотах круглаватай формы, якія ад перыферыі да цэнтра паступова запаўняюцца крышталічным або калоідным рэчывам.

ЖЭРАХ (Aspius aspius), рыба сям. карпавых. Водзіцца ў рэках бас. Паўночнага, Балтыйскага, Чорнага, Каспійскага і Аральскага мораў (любіць раўнінныя часткі рэк, заплывае ў праточныя азёры). На Беларусі (нар. назвы: бялізна, бялюга, шэраспер, жэрасць і інш.) водзіцца ўсюды.



Даўж. цела да 80 *см*, маса да 12 *кг*. Палаваспелы на 4—5-м годзе. Нерастуе ў канцы сак. і крас. Кладзе 60—500 тыс. ікрынак. Моладзь корміцца зоапланктонам, з 2—3 месяцаў маляўкамі рыб. Дарослы Ж.— тыповы драпежнік. Зімою залягае ў ямах, не корміцца. Прамысл. від.

Літ.: Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965.


ЖЭРДЗЬ, чыг. ст. на лініі Жлобін — Калінкавічы, пасёлак (Жардзянскі) у Чыркавіцкім с/с Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. За 11 *км* на ПдЗ ад Светлагорска, 121 *км* ад Гомеля. 166 ж., гасп. 56 (1971). Магазін.

ЖЭРЫКО (Géricault) Тэадор (26.9.1791, Руан — 26.1.1824), французскі жывапісец і графік, найбуйнейшы прадстаўнік прагрэс. рамантызму. Вучыўся ў К. Верпэ (1808—10) і П. Герэна (1810—11). Мастацтва Ж. вызначаецца эмацыянальнай напружанасцю, драматызмам, глыбокай пачуццёвасцю вобразаў; карціпам уласцівыя рэзкія святлоценовыя кантрасты, дынамічная кампазіцыя, энергічная і моцная лепка аб'ёмаў, выразны рысунак («Афіцэр конных егераў», 1812; «Ранены кірасір», 1814; «Плыт «Медузы», 1818—19; «Скачкі ў Эпсаме», 1821; і інш.).

Літ.: Прокофьев В. Н. Теодор Жерико, М., 1963.

ЖЭРЫНСКАЕ, возера ў бас. р. Усвейкі, правага прытока Улы (бас. Зах. Дзвіны), у Чашніцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 8,1 *км*². Даўж. 6,2 *км*, найб. шыр. 1,7 *км*, сярэдняя 1,3 *км*, найб. глыбіня 4,2 *м*, сярэдняя 1,3 *м*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд, схілы спадзістыя, выш. 10—15 *м*, вах. і паўн. ўкрыты мяшаным лесам, усх. і паўд. хмызняком і часткова разараныя. Берагі нізкія, пераважна забалочаныя. Дно плоскае, услана тоўстым слоем слабамінералізаванага ілу. Вадазбор (45,2 *км*²) узгорысты, складзены з марэны. Возера моцна зарастае. Сцёк праз воз. Святое ў р. Усвейку. Водзяцца карась, шчупак, акунь, плотка, верхаводка, ляшч і інш.

ЖЭСТАЎ МОВА, гл. ў арт. *Мова*.



З, дзевятая літара беларускага алфавіта. Паходзіць з кірыліцкай **з** («зямля»), утворанай на аснове візант. «дзэты» (z). У старабел. пісьменнасці мела некалькі варыянтаў і лічбавае значэнне 7. У сучаснай бел. мове абазначае шумны звонкі зубны шчылінны гук «з (з')» («зара», «зіма»), а перад глухімі вычнымі і на канцы слоў — парны да яго па звонкасці гук «с (с')», («казка», «воз», «лезь» вымаўляецца «каска», «вос», «лесь»).

«ЗА РАДЗІМУ», назва ў Айч. вайну і ў 1944—56 газ. *«Магілёўская праўда»*.

«ЗА САВЁЦКУЮ БЕЛАРУСЬ», франтавая газета, якая выходзіла на беларускай мове з ліп. 1941 да кастр. 1942. Выдавалася Упраўленнем паліт. прапаганды Зах. фронту, з № 3 — Паліт. управленнем Зах. фронту, з № 14 — Паліт. управленнем Цэнтр. фронту, з № 19 — Паліт. управленнем Бранскага, апошнія нумары — Заходняга фронту. Была разлічана на насельніцтва Беларусі, часова акупаванай нямец.-фаш. захопнікамі, і бел. партызанаў. У № 1 ад 11.7.1941 апублікавала звароты СНК і ЦК КП(б) Беларусі да бел. народа «Свабодалюбівы і гераічны беларускі народ!», у № 6 ад 25.7.1941 — «Прысягу беларускага партызана». Друкавала артыкулы пра мужнасць і гераізм партызанаў і інфармацыю пра падзеі на фронце і прац. гераізм сав. народа. Змяшчала творы Я. Коласа, Я. Купалы, П. Броўкі, П. Глебкі, К. Крапівы, М. Лынькова, П. Панчанкі, М. Танка і інш. Рэдактар газеты М. Ц. Лынькоў.

Літ.: Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967, с. 275—276.

«ЗА СВАБОДНУЮ БЕЛАРУСЬ», газета Паліт. ўпраўлення Калінінскага фронту, якая выдавалася з 18 сак. да ліст. 1942 на беларускай мове. Разлічана была на насельніцтва Беларусі, часова акупаванай нямец.-фаш. захопнікамі, і бел. партызанаў. Заклікала сав. людзей актыўна змагацца з ворагам. У № 106 ад 20.4.1942 надрукаваны зварот ЦК КП(б)Б, СНК і Прэзідыума Вярх. Савета БССР «Да працоўных Беларусі». Публікавала артыкулы пра герояў Айч. вайны, інфармацыю пра падзеі на франтах і працоўны гераізм сав. народа. Змяшчала творы Я. Коласа, П. Броўкі, П. Глебкі, К. Губарэвіча, І. Гурскага, К. Кірэенкі, К. Крапівы, Ц. Крыскo (В. Віткі), А. Куляшова, М. Лужаніна, М. Лынькова, П. Панчанкі, М. Танка і інш.; творы рус. пісьменнікаў У. Вішнеўскага, У. Лідзіна, А. Суркова, М. Ціханава, І. Эрэнбурга і інш. У газеце ўдзельнічалі бел. і рус. мастакі Я. Зайцаў, В. Гараеў, Я. Галяхоўскі, А. Вярэйскі і інш. Выдавала сатыр. лісток *«Партызанская дубінка»*. Рэдактар газеты І. Д. Гурскі.

ЗАА..., з о а... (ад грэч. zōon жывёла), частка складаных слоў, якая паказвае на адносіны да жывёльнага свету, напр. *заалогія*.

ЗААЗЁР'Е, вёска ў Лепельскім р-не Віцебскай вобл., на р. Зеха, каля воз. Воранъ (1,5 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса імя Карла Маркса. За 12 *км* на Пн ад Лепеля, 124 *км* ад Віцебска, на шашы Лепель — Ушачы. 153 ж., гасп. 56 (1971). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску спалілі нямец.-фаш. захопнікі. Помнік 56 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗААЗЁР'Е, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Тураўлянскі». За 10 *км* на Пд ад Полацка, 110 км ад Віцебска, каля шашы Полацк — Мінск (1,5 *км*). 261 ж., дворэў 86 (1971). Тураўлянскае лясніцтва, швейная і шавецкая майстэрскае лясніцтва, швейная і шавецкая майстэрскі. Васьмігадовая школа, клуб, дзіцячыя ясляні. сад, урачэбны ўчастак, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны.

ЗААЛАГІЧНЫ ПАРК (з а а л а г і ч н ы с а д), навукова-асветная і даследчая ўстанова, у якой утрымліваюць, дэманструюць і вывучаюць дзікіх і некат. свойскіх жывёл.

З. п. існавалі ў Ст. Егіпце каля 3500 гадоў назад. У Еўропе ўзніклі ў 12—13 ст., большасць іх ваз. У Еўропе ўзніклі ў 12—13 ст., большасць іх васпанавана ў 19 ст.: у Лондане (1826), Маскве (1864), Пецярбурзе (1865), Гамбурзе (1869), Заагарні ёсць у Кіеве (1908), Каване (1925), Свярдлоўску (1926), Ташкенце (1926), Тбілісі (1927), Ашхабадзе (1929), Адэсе (1936) і інш. гарадах СССР. З. п. працуе ў Гродне (засн. ў 1929, адноўлены ў 1945). У 1967 на ўсіх кантынентах свету іх было каля 600, у СССР 26. Многія заапаркі вядуць н.-д. работу па акліматызацыі, размнажэнні, кармленні жывёл, даследуюць пытанні вышэйшай нервовай дзейнасці, спячкі і інш.

Літ.: Герасимов В. П. Учебные экскурсии в зоологический парк, в. 1, М., 1950; Московский зоопарк. Сб. ст., М., 1961.

ЗААЛО́ГІЯ (ад *заа...+...логія*), навука пра жывёльныя арганізмы, адна з асн. частак *біялогіі*. Вывучае будову жывёл, іх жыццядзейнасць, індывідуальнае і гістар. развіццё, класіфікацыю, пашырэнне на зямлі і сувязі з навакольным асяроддзем. Дае навук. абгрунтаванне практ. выкарыстанню жывёльнага свету і яго рэканструкцыі. Падзяляецца на шэраг спецыялізаваных навук. дысцыплін: *марфалогію жывёл*, параўнальную анатомію, *фізіялогію жывёл*, *экалогію*, *сістэматыку жывёл* і інш. У адпаведнасці з групамі жывёл, якія вывучаюцца, вылучаюць *акаралогію*, *арніталогію*, *іхтыялогію*, *паразіталогію*, *тэрыялогію*, *энтамалогію* і інш.

Першыя літ. звесткі пра жывёл ёсць у старажытна-інд., егіп. і кіт. творах (3—2 ст. да н. э.). Вядомыя заалагічныя працы Арыстоцеля. Асаблівае значэнне для развіцця З. мелі вялікія геагр. адкрыцці (адкрыццё Амерыкі і інш.). Расшырылася кола вядомай фаўны, што выклікала неабходнасць сістэматызаваць сабраныя веды. У 1758 выйшла 10-е выд. працы швед. біёлага К. Лінея «Сістэма прыроды», у якой ён падзяліў усіх жывёл на класы, атрады, роды і віды, даўшы для назвы віду бінарную намянклатуру. Франц. натураліст Ж. Бюфон апісаў біялогію многіх жывёл. У пач. 19 ст. франц. натураліст Ж. Б. Ламарк перабудаваў і здекладніў сістэму класіфікацыі беспазваночных жывёл. Вял. фактычны матэрыял, сабраны да сярэдзіны 19 ст., даў магчымасць Ч. Дарвіну пакласці эвалюц. развіццё арган. свету — відаўтварэнне (гл. *Дарвінізм*, *Эвалюцыйнае вучэнне*). У 2-й пал. 19 ст. на аснове матэрыялаў параўнальнай анатоміі, эмбрыялогіі і палеазаалогіі ням. прыродазнавец Э. Гекель сфармуляваў *біягенетычны закон*. Пасля Кастр. рэв. ў СССР даследаванні па З. набылі вялікую практ. накіраванасць. Створана вучэнне пра дэвастацыю (акад. К. І. Скрабін). Паразіталагічныя работы пад кіраўніцтвам акад. Я. Н. Паўлоўскага закончыліся стварэннем вучэння аб прыроднай асяроддзі хвароб. В. А. Догель распрацаваў экалагічную паразіталогію. Вядомыя энтамалагічныя работы М. М. Кулагіна, У. П. Пяспелава, А. В. Мартынава, А. К. Мардзілкі, М. А. Халадкоўскага. Вялікі ўклад у развіццё З. пазваночных зрабілі таксама М. А. Северцаў, С. І. Агіёў, М. А. Бобрынскі, А. М. Фармозаў, П. П. Сушкін, М. А. Мензбір, Г. П. Дзямянцьеў, М. А. Гладкоў, У. Г. Гептнер, П. В. Цярэшчэў, С. А. Чарноў, Л. С. Берг, Л. А. Зенкевіч, Г. В. Нікольскі, М. М. Кіпоціч і інш. Шырока ўжываецца эксперым. метад даследаванняў. Выкарыстоўваюцца дакладныя метады фізікі, хіміі і матэматыкі. Асаблівае значэнне мае выкарыстанне электроннага мікраскопа, радыеактыўных ізатопаў і інш. Вядуцца палявыя, экспедыцыйныя і лабараторныя даследаванні. У СССР гал. роля ў заалагічных даследаваннях належыць ін-там АН СССР: заалагічнаму, марфалогіі, палеанталагічнаму. Вялікая роля навук. т-ваў (Маскоўскае т-ва даследчыкаў прыроды, Усесаюзнае гельмінталагічнае т-ва і інш.). Працы па З. друкуюцца ў часопісах «Зоологический журнал», «Вестник зоологии» (СССР); «Zoologica» («Заалогія», ЗША); «Journal of the Linnean Society of London» («Заалагічны часопіс Лінеўскага таварыства», Англія); «Zoologischer Anzeiger» («Веснік заалогіі», ГДР); «Przegląd Zoologiczny» («Агляд па заалогіі», ПНР) і інш. Гл. таксама *Біялагічныя часопісы*.

Заалагічныя даследаванні на Беларусі ў дарэвалюц. час былі эпізадычныя, рабіліся аматарамі і на невялікіх тэрыторыях. У 1924—30 вялікі калекцыйны і экалагічны матэрыял па арнітафаўне і тэрыяфаўне сабраў праф. А. У. Фядзюшын. Даследаваннямі па З. ў 1934—40 кіраваў акад. М. М. Кулагін; у 1946—52 акад. М. Е. Макушок, з 1953 чл.-кар. АН БССР І. М. Сяржанін. Заалагічныя працы ў БССР каардынуе Аддзел заалогіі і паразіталогіі АН БССР. Пасля Вял. Айч. вайны праведзены даследаванні па млекакормячых (І. М. Сяржанін, В. М. Міхалап, Ф. Я. Рубін, В. Ф. Цераховіч, П. П. Грыгор'еў, Ю. Ц. Пятроўскі, Ю. І. Сяржанін), птушках (М. С. Долбік, В. Ф. Гаўрын, Б. З. Галадушка), рыбах (С. В. Кахненка, П. І. Жукаў, Ф. Н. Варонін, Г. В. Гладкі, Я. А. Баравік, А. Л. Штэйнфельд, Н. І. Савіна, У. П. Ляхновіч, У. С. Пенязь), біял. рэсурсах вадаёмаў (Г. Г. Вінберг, П. Р. Пятровіч, М. М. Драко), а таксама энтамалагічныя (А. Ф. Маркавец, В. І. Мержаеўская, Т. Ц. Бяздзенка, Т. Р. Іанісіяні, А. І. Глушчанка, Н. М. Гарбунова, А. І. Радкевіч, В. А. Радкевіч). З паразіталагічных даследаванняў вядомыя працы вучоных Х. С. Гарагляда, Р. С. Чабатарова, П. С. Іваноўай, В. І. Вацякова, І. Ц. Арзамасава, І. В. Меркушовай, І. В. Чыкілеўскай, М. І. Дылько, Г. Ф. Дзям'янчанкі, А. А. Маскачовай, С. І. Жарыкава. Пытанні З. ў БССР вывучаюць таксама ў БДУ, Бел. аддзяленні Усесаюзнага НДІ паляўнічай гасп. і звераградоўлі Цэнтрасаюза, Бярэзінскім дзярж. запаведніку, у Белавежскай пушчы, пед., с.-г., вет. ін-тах і навук.-доследных станцыях.

Літ.: Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Навука БССР за 50 год, Мн., 1968; Развитие биологии в СССР, М., 1967; Новиков П. А. и Наумов С. П. Зоология, М., 1965; Плавильщиков Н. Н. Очерки по истории зоологии, М., 1941; Руководство по зоологии, т. 1—3, 6, М.— Л., 1937—51; Догель В. А., Полянский Ю. И. и Хейсин Е. М. Общая протозоология, М. — Л., 1962; Курс зоологии, 7 изд., т. 1—2, М., 1966; Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961 (бібліягр.); Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965 (бібліягр.); Кохненко С. В. Биология и распространение угря, Мн., 1958 (бібліягр.); Винберг Г. Г. Первичная продукция водоемов, Мн., 1960. *І. М. Сяржанін.* Мінск.

ЗААНО́ЗЫ (*заа...+*nosos хвароба), а н т р о п а з а а н о з ы, заразныя хваробы, узбуджальнікі якіх паразітуюць у арганізме ў пэўных відаў жывёл і часам у чалавека. Група З. уключае каля 1/5 усіх інфекц. хвароб чалавека.

Крыніца інфекцыі — хворыя жывёлы, бацыланосьбіты, заражаныя прадукты (малако, мяса), прадметы навакольнага асяроддзя, забруджаныя выдзяленнямі хворых жывёл. Пашыраюць З. камары, мухі, блохі, грызуны, свойскія і дзікія жывёлы. З.— хваробы пераважна сезонныя і бываюць у пэўных мясцінах. Асн. З.: *сап*, *сібірская язва*, *чума*, *туларэмія*, *бруцэлёз*, *вемаравічныя ліхаманкі*, *шаленства*, *ящур*, *таксаплазмоз*, сезонныя энцэфаліты, *лептаспірозы*, *салманелёзы*, *арнітозы*.

Літ.: Ганнушкин М. С. Общая энзоотология, 4 изд., М., 1961; Паразитология и инвазионные болезни сельскохозяйственных животных, 3 изд., М., 1964. *І. Я. Голубеў.* Мінск.

ЗААСПО́РА (*заа...+*spora семя), клеткі ў многіх водарасцяў і некат. ніжэйшых грыбоў, праз якія адбываецца *бясполае размнажэнне*.

Утвараюцца ў спараносных органах — зоаспарангіях. Памеры 10—15 *мкм*. Шарападобныя, круг-

лявыя, грушападобныя. Перамяшчаюцца ў вадзе з дапамогай *жгуціка́ў*. Праз пэўны час трацяць жгуцікі, укрываюцца шчыльнай абалонкай і развіваюцца ў новы арганізм (грыб, водарасць). Параўн. *Споры*.

ЗААСТРАВЕ́ЧЧА (*Заастровічы*), вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Праўда». За 30 *км* на ПдУ ад Клецка, 170 *км* ад Мінска, 32 *км* ад чыг. ст. Клецк. 1804 ж., двароў 611 (1971). Лясніцтва, камбінат быт. абслугоўвання, буд.-мантажнае ўпраўленне меліярацыі. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, 10 магазінаў. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗААТЭХНІЧНАЯ АДУКА́ЦЫЯ, гл. *Сельскагаспадарчая адукацыя*.

ЗААТЭХНІ́ЧНЫ ЎЛІК, адзіныя, абавязковыя для ўсіх с.-г. прадпрыемстваў формы дакументацыі (акты, уліковыя карткі, ведамасці, дзённікі, журналы, кнігі), неабходныя для вядзення племянной работы ў жывёлагадоўлі і правільнай аплаты працы. У іх запісваюць звесткі пра паходжанне, жывую масу, экстэр'ер, плоднасць, скараспеласць с.-г. жывёлы, якасць прадукцыі і інш. Паказчыкі З. ў. выкарыстоўваюць пры *баніціроўцы*. Жывёлы, якія атрымалі пры баніціроўцы комплексны клас не ніжэй першага, запісваюцца ў дзярж. племянную кнігу.

Літ.: Справочник зоотехника, 3 изд., ч. 1—2, М., 1969.

ЗААТЭХНІЯ (*заа...*+techne навука, мастацтва), навука пра развядзенне, кармленне, догляд і выкарыстанне с.-г. жывёлы для атрымання найбольшай колькасці высакаякасных прадуктаў. Тэарэт. аснова *жывёлагадоўлі*. Цесна звязана і карыстаецца метадамі і дасягненнямі генетыкі, фізіялогіі, біяхіміі, матэматыкі. Падзяляецца на агульную і прыватную. Агульная З. распрацоўвае метады павышэння плоднасці, скараспеласці, прадукцыйнасці ўсіх відаў с.-г. жывёлы (мясной, малочнай, шэрснай), вывучае агульныя пытанні яе развядзення, кармлення і догляду. Прыватная З. вывучае і распрацоўвае тэорыю і тэхналогію асн. галін жывёлагадоўлі: малочнай і мясной, свінагадоўлі, авечкагадоўлі, конегадоўлі, птушкагадоўлі, трусагадоўлі, пчалярства, аверагадоўлі.

Як самастойная навука З. пачала складвацца ў 2-й пал. 18 ст. ў Англіі ў сувязі з развіццём капіталізму ў с. гасп. і поспехамі прыродазнаўства. Вял. значэнне для З. мела вучэнне Ч. Дарвіна як навук. аснова практыкі племянной справы. Асновы рускай заатэхн. навукі закладзены М. П. Чырвінскі, П. М. Куляшоў, М. І. Прыдарогін, Е. А. Багданаў, М. Ф. Іваноў, Я. Ф. Ліскун. Заснавальнікі З. на Беларусі І. І. Калугін, М. М. Кулагін, М. В. Найдзёнаў. Развіццю З. спрыялі працы М. М. Замяціна, В. А. Іваноўскі, У. П. Лемеша, К. М. Сонцава, В. Ц. Горына і інш. Н.-д. работы па З. ўзначальваюць Бел. НДІ жывёлагадоўлі. Даследаванні вядуцца па пытаннях генетыкі і развядзення, кармлення і догляду с.-г. жывёл, тэхналогіі вытворчасці прадуктаў жывёлагадоўлі ў калгасах і саўгасах БССР, эканомікі і арганізацыі жывёлагадоўлі. Вучоных заатэхнікаў вышэйшай кваліфікацыі рыхтуюць Бел. с.-г. акадэмія, Віцебскі вет. ін-т, Гродзенскі с.-г. ін-т. Гл. таксама *Развядзенне сельскагаспадарчай жывёлы*.

Літ.: Иванов М. Ф. Полн. собр. соч., т. 1—7, М., 1963—65; Лискун Е. Ф. Избранные труды, М., 1961; Борисенко Е. Я. Разведение сельскохозяйственных животных, 4 изд., М., 1967; Поповых И. С. Кормление сельскохозяйственных животных, 9 изд., М., 1957; Системы ведения сельского хозяйства Белорусской ССР, Мн., 1970; Технология производства продуктов животноводства в колхозах и совхозах БССР, Мн., 1970.

А. А. Гайко. Жодзіна.

ЗАБАБО́НЫ, памылковая вера ў што-небудзь, звязаная з улёленнямі пра надпрыродныя сілы, якія быццам бы вызначаюць жыццё людзей. Узніклі ў стараж. часы, калі чалавек быў бездапаможны перад сіламі прыроды, і развіліся ў класава-эксплуататарскім грамадстве.

Да З. адносяцца рэлігійныя прымхі, вера ў лёс, усялякая варажба (астралогія, хірамантыя, варажба на картах), вера ў чараўнікоў, ведзьмаў, шаманства, «урокі», памылковыя прадбачанні, прыкметы. З. асуджаюць людзей на пасіўнасць, пакорлівасць, спараджаюць нявпэўненасць у сваіх сілах. Пры сацыялізме далучэнне ўсіх грамадзян да актыўнай творчай працы, прапаганда навук. ведаў вядуць да зніжэння З.

Літ.: Сержпутоўскі А. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў, Мн., 1930.

Л. І. Мінько. Мінск.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Акцябрскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Ляскавіцкага сельсавета. За 28 *км* на З ад Акцябрскага, 235 *км* ад Гомеля, 27 *км* ад чыг. ст. Залессе. 845 ж., гасп. 321 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. У студз. 1944 вёску часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі, загубілі 192 мірных жыхароў (паводле ўдакладненых звестак). Помнік на брацкай магіле 28 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., на р. Адроў. Цэнтр Веравіцкага с/с і саўгаса «Забалацце». За 8 *км* на З ад Оршы, 88 *км* ад Віцебска, па шашы Орша — в. Смаляны. 232 ж., гасп. 78 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, магазін. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Цешаўляпскім с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр саўгаса «Іскра». За 17 *км* на ПнЗ ад Баранавіч, 220 *км* ад Брэста, 16 *км* ад чыг. ст. Палонка, каля аўтамаб. дарогі Баранавічы — в. Моўчадзь (2 *км*). 531 ж., гасп. 175 (1971). Швейная майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Альковіцкім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «За мір». За 50 *км* на У ад Вілейкі, 110 *км* ад Мінска, 40 *км* ад чыг. ст. Княгініна. 355 ж., двароў 91 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, сталовая, магазін.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Станькаўскім с/с Дзяржынскага р-на Мінскай вобл., каля р. Уса (1 *км*). Цэнтр калгаса «Непераможны сцяг». За 10 *км* на У ад Дзяржынска, 48 *км* ад Мінска, 7 *км* ад чыг. ст. Койданава. 359 ж., двароў 101 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 2 помнікі: землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і 12 мірным жыхарам вёскі, якіх у 1943 загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Махнавіцкім с/с Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Балышавіцкі змагар». За 45 *км* на ПдЗ ад Мазыра, 178 *км* ад Гомеля, 40 *км* ад чыг. ст. Козенкі. 356 ж., гасп. 99 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 28.7.1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 54 мірных жыхароў.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Дзедзінаўскім с/с Міёрскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». За 21 *км* на ПнЗ ад Міёраў, 211 *км* ад Віцебска, 23 *км* ад чыг. ст. Міёры. 88 ж., гасп. 20 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Мсціслаўскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Забалацце». За 84 *км* на ПдЗ ад Мсціслава, 136 *км* ад Магілёва, 11 *км* ад чыг. ст. Ходасы. 523 ж., двароў 173 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Калініна. За 12 *км* на ПдЗ ад Рагачова, 130 *км* ад Гомеля. 781 ж., гасп. 263 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Вёску двойчы (1941, 1944) спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнікі на дзвюх брацкіх магілах 85 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.


ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Міцкавіцкім с/с Смаргонскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях да камунізма». За 22 *км* на ПнУ ад Смаргоні, 282 *км* ад Гродна. 196 ж., гасп. 75 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗАБАЛА́ЦЦЕ, вёска ў Чавускім р-не Магілёўскай вобл. Падпарадкоўваецца Чавускаму гарсавету. Цэнтр калгаса «Юны камунар». За 5 *км* на ПнЗ ад Чавусаў, 53 *км* ад Магілёва, 9 *км* ад чыг. ст. Чавусы. 582 ж., двароў 209 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ЗАБАЛА́ЦЬ, вёска ў Воранаўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 53 *км* на ПдЗ ад Воранава, 80 *км* ад Гродна, 46 *км* ад чыг. ст. Бастуны, на шашы Радунь — Астрына. 892 ж., гасп. 321 (1971). Малочны з-д, млын, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, вет. пункт, аддз. сувязі, 5 магазінаў.

ЗАБАЛА́ЦЬ, вёска ў Юнкавіцкім с/с Любанскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 8 *км* на З ад Любані, 145 *км* ад Мінска, 20 *км* ад чыг. ст. Урэчча, каля шашы Любань — Салігорск (3 *км*). 590 ж., двароў 185 (1971). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ЗАБАЛО́ТНЫ Даніла Кірылавіч [10(28).12. 1866, с. Чабатарка Альгопальскага пав. Падольскай губ.— 15.12. 1929], савецкі мікрабіёлаг і эпідэміёлаг. Акад. АН СССР (1929) і АН УССР (1922, прэзідэнт яе ў 1928—29). Скончыў фіз.-матэм. ф-т Новарасійскага ун-та ў Адэсе (1891) і мед. ф-т Кіеўскага ун-та (1894). Заснавальнік першай у Расіі кафедры бактэрыялогіі ў Пецярбургскім ун-це (1898), ін-та мікрабіялогіі АН УССР у Кіеве (1928) і Міжнар. т-ва мікрабіёлагаў. Удзельнічаў у экспедыцыях па вывучэнні і барацьбе з чумой у Індыі, Аравіі, Манголіі, Кітаі і інш. Асн. працы па вывучэнні чумы (даследаваў прыродную ачаговасць, шляхі пашырэння, спосабы заражэння, метады вакцынацыі), халеры (даказаў бацыланосьбітва здаровымі людзьмі), сіфілісу (адкрыў узбуджальніка, распрацаваў дыягнастычныя сералагічныя рэакцыі).



Тв.: Избранные труды, т. 1—2, Киев, 1956—57.

Літ.: Третяк К. Музей Д. К. Заболотного, Одеса, 1968.

ЗАБАЛО́ЦКІ Анатоль Дзмітрыевіч (н. 16.10. 1935, г. Абакан), беларускі савецкі кінааператар. Засл. дз. маст. БССР (1967). Пасля заканчэння Усесаюзнага ін-та кінематаграфіі (1960) на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1960—61 другі аператар фільма «Першы выпрабаванні». З Ю. Марухіным зняў навелы «Камстрой» (фільм «Апавяданні пра юнацтва», 1961) і «Зорка на спражцы» («Маленькія летуценнікі», 1963), фільм «Апошні хлеб» (1963). Творчай манеры З. ўласцівыя вастрыня кампазіцыі, умелае валоданне святлом, выразнасць партрэтных характарыстык. Фільмы: «Праз могілкі» (1965), «Альпійская балада» (1966), «Вар'яцтва» (1969, студыя «Талінфільм»). Рэж.-аператар дакумент. кінанарысаў: «Сведкі вечнасці» (1965), «На старых сенажацях» (1966), «Ад подзвігу да подзвігу» (1969).

ЗАБАЛО́ЦКІ Мікалай Аляксеевіч [24.4(7.5). 1903, Казань — 14.10.1958], рускі савецкі паэт. З сям'і агранома. Скончыў Ленінградскі пед. ін-т імя Герцэна (1925). Друкавацца пачаў у 1928. Першая кн. вершаў «Слупкі» (1929). Роздум пра адвечны кругаварот прыроды, пра перамогу розуму над стыхіяй, сцвярджэнне велічы сав. чалавека надаюць паэзіі З. філас. характар (паэмы «Урачыстасць земляробства», 1929—30, апубл. 1933; «Звар'яцелы воўк», 1931, апубл. 1965; «Дрэвы», 1933, апубл. 1965; і інш.). Лірыцы З. ўласцівыя аналітычнасць стылю, маляўнічасць і пластычнасць вобразаў. Зрабіў паэт. пераклад «Слова аб палку Ігаравым» (1938—46). Перакладаў творы груз. (у т. л. «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш. Руставелі), укр., нім., італьян., венг. паэтаў. Узнаг. ордэнам Працоўнага Чырв. Сцяга.

Тв.: Стихотворения и поэмы, М.— Л., 1965.

Літ.: Турков А. М., Н. Заболоцкий, М., 1966; Македонов А. В., Н. Заболоцкий, Л., 1968.

ЗАБАЛО́ЦЦЕ, вёска ў Весялоўскім с/с Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 20 *км* на ПнЗ ад Барысава, 91 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Барысаў. 536 ж., гасп. 135 (1971). Цагельня, камбінат быт. абслугоўвання. Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ЗАБАЛО́ЦЦЕ, вёска ў Буда-Кашалёўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Іскра». За 22 *км* на ПнУ ад Буда-Кашалёва, 48 *км* ад Гомеля, на шашы Магілёў — Гомель. 715 ж., двароў 228 (1971). Млын, лесапільня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАБАЛО́ЦЦЕ, вёска ў Смалявіцкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Ленінскі шлях». За 5 *км* на ПдЗ ад Смалявіч, 36 *км* ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Смалявічы, на аўтамаб. дарозе Смалявічы — в. Самахвалавічы. 665 ж., двароў 173 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У 1942 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАБАРО́ЎЕ, вёска ў Заазерскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзімітрова. За 18 *км* на Пн ад Лепеля, 133 *км* ад Віцебска, каля шашы Лепель — Полацк (0,5 *км*). 225 ж., гасп. 74 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗАБАСТО́ЎКА (*стачка*), адна з асн. формаў класавай барацьбы пралетарыяту капіталіст. краін, калі рабочыя і служачыя адначасова адмаўляюцца выконваць работу, каб абараніць свае інтарэсы, дамагчыся ад прадпрыемцаў, кампаній ці ўрадаў задавальнення эканам. або паліт. патрабаванняў.

З. нарадзілася капіталізмам і спадарожнічае яму. Ёй папярэднічаў рух *лудзітаў*. Першыя стачкі (16—18 ст.) былі стыхійныя і неарганізаваныя, мелі толькі эканам. характар. У працэсе фарміравання класавай самасвядомасці пралетарыяту яны набывалі арганізаванасць, спалучаліся з паліт. патрабаваннямі, а ўзбр. барацьбой (гл. *Лёнскія паўстанні 1831, 1834, Сілезскае паўстанне ткачоў 1844*). Развіццё стачачнага руху пры капіталізме нарадзіла формы З.: частковую (не працуе частка рабочых прадпрыемства ці галіны гаспадаркі), масавую (удзельнічаюць працоўныя некалькіх прадпрыемстваў ці ўстаноў), лакальную (у межах аднаго раёна), усеагульную (ахоплівае ўсю краіну або якую-небудзь вял. галіну гаспадаркі). З. спрыялі ўзнікненню рабочых арг-цый, пашырэнню ідэй сацыялізма. З часу, калі барацьбу працоўных узначалілі пралет. партыі і прафсаюзы, забастоўчы рух стаў больш арганізаваны. Стварыліся рабочыя касы, стачачныя фонды для дапамогі забастоўшчыкам. Неабходнасць узаемадапамогі спрыяла заснаванню Міжнар. прафес. аб'яднанняў. Паступова З. ператварыліся ў магутную зброю эканам. і паліт. барацьбы працоўных. У Расіі першыя стыхійныя стачкі мелі характар бунтаў (18—1-я пал. 19 ст.). Пасля *Сялянскай рэформы 1861* працоўныя пачалі выстаўляць эканам. патрабаванні (*Морозаўская стачка* 1885, хваля забастовак 1885—86). У пач. 20 ст. стачкі перарастаюць у палітычныя і ўсеагульныя (*«Абухаўская абарона» 1901*, З. ў Растове-на-Доне 1902, на Украіне 1903, *Бакінскія стачкі* і г. д.). У кастр. 1905 рускі пралетарыят упершыню ў гісторыі пачаў усеагульную З. ў маштабе краіны. Іванава-вазнясенскія ткачы пад кіраўніцтвам бальшавікоў стварылі Савет упаўнаважаных, які быў прататыпам масавых паліт. арг-цый рабочага класа — Саветаў рабочых дэпутатаў, што ўзніклі ў рэвалюцыю 1905—07. Пад уплывам рэвалюц. барацьбы рус. пралетарыяту нарадзіўся і мацнеў рабочы рух на Беларусі. У 1901—03 у ло зах. губернях, паводле няпоўных звестак, было 116 стачак. Калі ў Маскве пачалося ўзбр. паўстанне 1905, у Мінску забаставалі ўсе прадпрыемствы, пошта, тэлеграф. Паліт. стачкі ахапілі Гомель, Брэст, Оршу, Лунінец, Баранавічы, Пінск; у 25 з 35 паветаў Беларусі прайшлі З. с.-г. рабочых (гл. *Баранавіцкае выступленне рабочых і салдат 1905, «Бульбяная забастоўка» 1906, Гомельскае выступленне рабочых 1905, Пінскае выступленне рабочых 1905*).

Стачачная барацьба была важным фактарам рэвалюц. ўздыму ў Расіі напярэдадні 1-й сусв. вайны. З лютаўскай усеагульнай З. 1917 у Пецярбурзе пачалася 2-я рус. бурж.-дэмакр. рэвалюцыя, якая скончыла з царызмам. Міжнар. пралетарыят шырокім стачачным рухам падтрымаў Вял. Кастр. сацыяліст. рэвалюцыю, змагаўся супраць спроб імперыял. дзяржаў задушыць маладую Сав. рэспубліку. У гады грамадз. вайны і ваен. інтэрвенцыі ў СССР 1918—20 на Беларусі адбыліся выступленні працоўных супраць замежных акупантаў (гл. *Гомельскія забастоўкі 1918*).

На канец 20-х і ў 30-я г. актывізаваўся рабочы рух у Зах. Беларусі. Толькі ў 1927—23 у Беластоцкім, Віленскім, Палескім і Навагрудскім ваяводствах зарэгістравана 370 забастовак. Пачасціліся масавыя выступленні працоўных Брэста, Ліды, Беластока, Пінска, Маладзечна, Навагрудка і інш. гарадоў. Эканам. патрабаванні спалучаліся з барацьбой супраць рэакц. палітыкі польскай буржуазіі і памешчыкаў, за нац. вызваленне, уз'яднанне бел. народа ў адзінай Сав. дзяржаве. У радах забастоўшчыкаў уліваліся с.-г. рабочыя, служачыя і інш. колы насельніцтва. Кіраўніцтва стачачнай барацьбой КПЗБ.

З. адыгралі вял. ролю ў арганізацыі адзінага нар. фронту супраць наступлення фашызму (стачачныя баі 1934 у Іспаніі і Францыі), сталі важнай формай нац.-вызв. і рэвалюц. барацьбы народаў калоній і паўкалоній. У 2-ю сусв. вайну ў акупаваных фашыстамі краінах распаўсюдзіліся ранейшыя характэрныя Італіі стачкі «скрыжаваных рук» (зніжэнне тэмпаў і прадукцыйнасці працы), З. супраць акупац. рэжыму (Люксембургская стачка 1942, Афінская усеагульная З. 1943, усеагульная З. пратэсту 1944 у Даніі і г. д.). Забастовачнаму руху пасля 2-й сусв. вайны ўласцівы яшчэ большы масавасць (гл. табл.) і актыўнасць, расшырэнне сац. базы, уздым барацьбы ў калан. і залежных краінах, імкненне пралетарыяту да адзінства, рашучасць стачак. Барацьба за задавальненне эканам. патрабаванняў шырока спалучаецца з барацьбой за сац. пераўтварэнні (агр. рэформы, нацыяналізацыю). Характэрнымі сталі агульнанац. выступленні («дні адзінай дзеянняў», «нац. дні барацьбы» і г. д.). Пашырыліся замаруджванне тэмпаў работы, раптоўныя З. (без папярэджання адміністрацыі), «шахматныя» З. (чачгарговае кароткатэрміновае спыненне работы ў асобных прадпрыемствах, якое поўнасцю дэзарганізоўвае прадпрыемства), *«забастоўка наадварот»*, салідарнасці і г. д. Каб знізіць напал стачачнай барацьбы, панучы клас ужывае разнастайныя сродкі: заканадаўчае абмежаванне права працоўных на забастоўку, прымусовы арбітраж, прыцягненне да судовай адказнасці (гл. *Тафта — Хартлі закон*), звальненне арганізатараў і актыўных удзельнікаў З., штрафы, выкарыстоўвае штрэйкбрэхерства, адкрытую паліцэйскую расправу. Працоўныя адказваюць на гэта новымі выступленнямі, абараняюць права на З. як на адну з найважнейшых сваіх заваёў.

У майска-чэрвеньскай З. 1968 у Францыі ўдзельнічала 10 млн. чал., 12 млн. італьян. працоўных выставалі ў ліст. 1968, 18 млн.— у лют. 1969, у «вясенавым наступленні» 1968 у Японіі — 14 млн. чал.

Колькасць удзельнікаў забастовачнага руху ў капіталістычных краінах (млн. чал.)

Гады	Увесь капіталістычны свет	Індустрыяльна развітыя капіталістычныя краіны
1960	56	44
1961	51	42
1962	55	41
1963	57	42
1964	56	35
1965	36	20
1966	44	27
1967	46	30
1968	57	43
1969	60	44
1970	64	45

З кожным годам абвастраецца класавая барацьба ў ЗША. У 1970 там было толькі буйных 5600 З., страчана 62 млн. рабочых дзён. Пад націскам рабочага руху манаполіі вымушаны ісці на некат. ўступкі ў галіне заработнай платы, паляпшэння умоў працы, сац. забеспячэння і інш.

Масавы стачачны рух абвяргае бурж. і апартуніст. тэорыі і канцэпцыі пра «затуханне класавай барацьбы», пра «ўрастанне» рабочага класа ў дзярж.-манапаліст. сістэму, пра «страту» ім рэвалюцыйнасці. Магутныя стачачныя баі пераканаўча пацвярджаюць, што барацьба працоўных усё больш накіроўваецца супраць самой сістэмы панавання манапаліст. капіталу.

Літ.: Энгельс Ф. Становішча рабочага класа ў Англіі, Маркс К. і Энгельс Ф. Аб Англіі, Мн., 1954; Ленін У. І. Аб стачках, Тв., т. 4 (Полн. собр. соч., т. 4); Ягож. Эканамічная і палітычная стачка, Тв., т. 18 (там жа, т. 21); Ягож. Развіццё рэвалюцыйнай стачкі і вулічных дэманстрацый, Тв., т. 18 (там жа, т. 22); Ягож. Стачкі металістаў у 1912 годзе, Тв., т. 19 (там жа, т. 23); Краткая история рабочего движения в России (1861—1917), М., 1962; История Белорусской ССР, т. 1, 2 изд., Мн., 1961; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939), Мн., 1966; Воранава А. І. Рабочы рух у Беларусі напярэдадні і ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг., Мн., 1960; Панютич В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии. 1861—1914 гг., Мн., 1969. *М. Р. Круцько.* Мінск.

«ЗАБАСТО́ЎКА НААДВАРОТ» (італьян. sciopero a rovescio), форма класавай барацьбы працоўных за права на працу.

Удзельнікі «З. н.» арганізавана пачынаюць агульнакарысныя работы, якія намечаны, але не ажыццяўляюцца (буд-ва дарог, каналаў, мастоў, асушэнне балотаў), а потым патрабуюць аплаты сваёй працы, гарантый работы на пачатым буд-ве, давядзення яго да канца. «З. н.» шырока практыкавалася ў Італіі ў 1949—53 у перыяд прамысл. рэканструкцыі і вострага беспрацоўя. Своеасаблівай формай барацьбы працоўных у Італіі. вёсцы стаў захоп батракамі і малавямельнымі сялянамі памешчыцкіх зямель, якія не апрацоўваюцца. Італьян. кампартыя актыўна падтрымлівае «З. н.», разглядае іх як адну з формаў масавай барацьбы працоўных супраць манаполій і памешчыкаў.

ЗАБАШАВІ́ЧЫ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Вясёлка». За 32 *км* на Пд ад Барысава, 103 *км* ад Мінска, 27 *км* ад чыг. ст. Барысаў, на аўтамаб. дарозе, якая звязвае вёску з раённым цэнтрам. 1072 ж., двароў 281 (1971). Лясніцтва, пякарня, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі, бальніца, антэка, аддз. сувязі, 4 магазіны. Помнікі на дзвюх брацкіх магілах 146 і 9 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАБЕ́ЛА Васіль Сцяпанавіч [7(20).5.1901, в. Кішчына Слабада Барысаўскага пав. Мінскай губ.— 4.12.1949], дзярж. дзеяч БССР, адзін з арганізатараў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Мінскі політэхн. ін-т (1935). З 1914 парабкаваў. У 1922—24 у Чырв. Арміі, пасля на сав. і парт. рабоце. З ліп. 1938 нарком камунальнай гасп. БССР. У Вял. Айч. вайну ўдзельнічаў у арганізацыі партыз. руху, чл. Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б. З мая 1945 нам. старшыні СНК БССР, з сак. 1949 міністр камунальнай гасп. БССР. На XIX з'ездзе КП(б)Б выбраны канд. у чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі.

ЗАБЕ́ЛА Мікалай Міхеевіч [3(15).11.1862, Чэрыкаўскі пав. Магілёўскай губ.— 19(31).7.1885], дзеяч рэвалюц. руху 70—80-х г. 19 ст. ў Расіі, народнік. З дробных дваран. У час навучання ў Магілёўскай гімназіі «хадзіў у народ», вёў агіт. работу сярод сялян, вывучаў і збіраў вусную нар. творчасць. Сабраў вялікую колькасць узораў хлеба, які выпякаўся сялянамі губерні, і змясціў іх у музеі. У Кіеве вёў рэвалюц. прапаганду сярод рабочых-чыгуначнікаў. Арыштаваны ў крас. 1883 і ў 1884 высланы ў Забайкалле.

М. Ф. Мельнікаў. Крычаў.

ЗАБЕ́ЛА Тодар Іванавіч [сак. 1896, в. Чабусы Бабруйскага пав.— пасля 1935 (?)], беларускі савецкі гісторык. Скончыў педфак БДУ (1925). З 1921 пастаўнічаў у Мінску, з восені 1929 да ліп. 1930 працаваў у Магілёўскім архіве. У пач. 30-х г. навук. супрацоўнік АН БССР. Даследаваў гісторыю сялянства і с. гасп. Беларусі 2-й пал. 18 ст. Вывучаў становішча панскіх слуг і чэлядзі, баяр і зямян. Упершыню ў сав. гістар. літаратуры звярнуў увагу на быт бел. сялянства.

Тв.: Землеўласнік і земляроб па Статуту літоўскаму 1588 г., Мн., 1928; Панская гаспадарка на Беларусі і быт падданага сялянства ў другой палове XVIII стагоддзя, Мн., 1928; Места Берасцейскае ў XVI стагоддзі (сацыяльна-эканамічны нарыс), Мн., [1930]. *В. І. Мялешка.* Мінск.

ЗАБЕ́ЛІН Іван Ягоравіч [17(29).9.1820, Цвер — 31.12.1908 (13.1.1909)], рускі бурж. гісторык і археолаг. Ганаровы чл. АН (з 1907). Адзін з арганізатараў *Гістарычнага музея* ў Маскве, у 1883—1908 яго фактычны кіраўнік. Вывучаў гісторыю Старажытнарус. дзяржавы, Масквы, побыт феад. эпохі, гісторыю рус. мастацтва і рамяства («Хатні побыт рускага народа ў 16 і 17 ст.», 1862—69; «Гісторыя горада Масквы», ч. 1, 2 выд., 1905; «Гісторыя рускага жыцця з найстаражытнейшых часоў», ч. 1—2, 1876—79, 2 выд., 1908—12). Апублікаваў «Матэрыялы для гісторыі, археалогіі і статыстыкі г. Масквы» (ч. 1—2, 1884—91). Даследаваў скіфскія і грэч. курганы на Пд Расіі; упершыню распрацаваў навук. методыку раскопак вял. курганоў.

Літ.: Кузьминский К. С., И. Е. Забелин и его печатные труды, М., 1912; Арцихов-

ский А. В. Забелин — археолог, у кн.: Историко-археологический сборник, М., 1948.

ЗАБЕ́ЛЛЕ, вёска ў Соржыцкім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., на вах. Бярэзе возера Белае. Цэнтр калгаса «Уперад». За 24 *км* на У ад Бешанковіч, 43 *км* ад Віцебска, 26 *км* ад чыг. ст. Старое Сяло, на шашы Сянно — шаша Віцебск — в. Камень. 168 ж., гасп. 52 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, магазін. Абеліск землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗА́БЕЛЬ Антон, гл. *Абрамовіч* З. І.

ЗАБЛО́ЦКІ (Лада-Заблоцкі; Zabłocki Łada) Тадэвуш (27.8.1811, в. Лугінава Сенненскага пав. Магілёўскай губ.— 1847), польскі паэт і рэвалюцыянер. Вучыўся ў Віцебскім базыльянскім вуч. і гімназіі, на літ. адцд. Маскоўскага ун-та (з 1831). У Маскве заснаваў пелегальнае т-ва аматараў роднай л-ры, якое вяло рэвалюц. работу на Беларусі, пашырала вершы дзекабрыстаў. Сябраваў з В. Р. Бялінскім. У 1833 выключаны з ун-та і пасаджаны ў Віцебскую турму. У маі 1837 прыгавораны да 22 гадоў ссылкі (адбываў на Каўказе). Паэт. творчасць на польскай, рус. і, магчыма, на бел. мовах пачаў у гімназіі. Быў пад уплывам польскага рэвалюц. рамантызму. Апяваў хараство Беларусі (паэма «Ваколіцы Віцебска», элегіі «Да Дзвіны», «Да Лучосы», «Вілія»), Каўказскіх гор. У 1845 Р. *Падбярэскі* выдаў у Пецярбурзе яго зб. «Паэзія».

Тв.: Chansons de l'Ukraine, Paris, 1845; Fantazje, Warszawa, 1856.

Літ.: Поляков М. Студенческие годы Белинского, у кн.: Литературное наследство, т. 56, М., 1950; Поссе В. Новое о Белинском, «Неман», 1968, № 4; Inglot M. Polacy piszący na Kaukazie w pierwszej poł. XIX w., «Pamiętnik Literacki», 1957, rocz. 48, zesz. 2; Kubacki W. Malwy na Kaukazie, Warszawa, 1969. *А. І. Мальдзіс.* Мінск.

ЗАБЛО́ЦКІ Эразм Карлавіч (н. каля 1831 — г. см. невяд.), удзельнік паўстання 1863 на Беларусі. З дробных дваран. Служыў у буд. і дарожнай камісіі ў Гродне. У 1861 увайшоў у гродзенскую рэвалюц. арг-цыю К. Каліноўскага. З вясны 1863 паўстанцкі цывільны нач. Гродзенскага ваяводства. З чэрв. 1863, пасля ад'езду К. Каліноўскага ў Вільню, выконваў абавязкі ваяводскага камісара. Увосень 1863 арыштаваны і засуджаны на 15 гадоў катаржных работ.

Літ.: Рэвалюцыйны пад'ём у Літве і Беларусі 1861—1862 гг., М., 1964 (Восстание 1863 г. Материалы и документы). *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

ЗАБО́ЙНАЯ ВАГА І ВЫ́ХАД, гаспадарча-біялагічныя паказчыкі с.-г. жывёлы. Забойная вага — вага жывёлы без скуры, галавы (свіней з галавою), ног і вантробаў. Забойны выхад — адносіны забойнай вагі да жывой вагі (масы). У буйн. раг. жывёлы складае 50—65% і больш, у свіней 70—85 і больш, у авечак 40—60, у птушак 75—88%.

ЗАБО́ЙСТВА, проціпраўнае наўмыснае або неасцярожнае пазбаўленне жыцця чалавека. Адказнасць за З. настае з 14 гадоў (арт. 10 КК БССР).

Найб. цяжкае злачынства — наўмыснае З. пры абцяжваючых абставінах (з-за карыслалюбства, хуліганскага намеру, пры выкананні пацярпелым службовага ці грамадскага абавязку, З. цяжарнай жанчыны або звязанае са згвалтаваннем і інш.) — караецца смерцю (арт. 100 КК БССР) або пазбаўленнем волі на 8—15 гадоў (са ссылкай ці без яе). Крымін. кодэкс прадугледжвае адказнасць (з 16 гадоў) таксама за давядзенне да самагубства (арт. 105 КК БССР), укрывальніцтва наўмыснага З. (арт. 185 КК БССР) і недапаўненне пра яго (арт. 186 КК БССР; гл. таксама *Злачынствы супраць асобы*). У СССР колькасць З., асабліва з-за карыслівых намераў, увесь час змяншаецца. У капіталіст. краінах іх колькасць расце. У ЗША ў 1969 учынена 15 тыс. З., што на 66% больш, чым у 1960. З. ўчыняюць не толькі асобныя людзі, але і цэлыя гангстэрскія прафес. арг-цыі забойцаў (гл. *Гангстэрызм*). Паліт. З. сталі нормай грамадскага жыцця ЗША.

Кр.: Уголовный кодекс Белорусской ССР. Мн., 1965. *М. А. Яфімаў.* Мінск.

ЗАБО́РАЎ Абрам Барысавіч [н. 18.2(3.3). 1911, мяст. Лёзна Віцебскай губ.], беларускі савецкі жывапісец. Чл. КПСС з 1952. Пасля сканчэння Віцебскага маст. тэхнікума (1930) у Мінску. У 1941—45 у Сав. Арміі. Працуе ў галіне бытавога і гістар. жанру, партрэта. Сярод работ: «Чапаеў», 1935; «Дзе сын?», 1939; «На малочнай ферме», 1948; «Партрэт спявачкі Н. Гусельнікавай», 1950; «Рыбакі возера Нарач», 1957; «Вечар на рэйдзе», 1960; «У рыбалавецкім саўгасе», 1961; «Балтыйцы», 1963; трыпціх «На зямлі, на моры і ў небе», 1965; «Клятва народных мсціўцаў», 1967; «Салдаты Кастрычніка», 1969; «Чырвоныя эскадроны», 1970, і інш. У Дзярж. маст. музеі БССР 7 твораў мастака.



А. Б. Забораў. Салдаты Кастрычніка. 1969. Дзярж. маст. музей БССР.

ЗАБО́РАЎ Барыс Абрамавіч (н. 16.10.1935, Мінск), беларускі савецкі графік, жывапісец. Пасля заканчэння ў 1961 Маск. дзярж. ін-та імя Сурыкава працуе ў Мінску. Сярод работ ілюстрацыі да кніг: «Гамлет, прынц Дацкі» (1964) і «Сапеты» (1964) У. Шэкспіра, «Мой хлеб надзённы» М. Танка (1965), латышскія народныя казкі «Залаты скарб» (1965), «Выбраная лірыка» Я. Купалы (1967), «Раскідач» Р. Баладуліна (1969), «Дзітэ — дзіця чалавечае» М. Андэрсена-Нексё (1969), «Армянскія народныя казкі» (1969), апавяд. Ф. Дастаеўскага «Пакорлівая» (1971) і інш. Жывапісныя творы: партрэт эст. мастачкі І. Арэк (1962), серыя «Стары Талін» (1965), «Сазопальскія рыбакі» (1965), «Палескія музыканты» (1966). У т-ры імя Я. Купалы афарміў спектаклі «Тысяча франкаў узнагароды» В. Гюго (1962) і «Мой бедны Марат» А. Арбузава (1965). У Дзярж. маст. музеі БССР 19 твораў мастака. Ін. гл. на ўкл. да арт. *Графіка.*

ЗАБО́Р'Е, вёска ў Расонскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Азіна. За 40 *км* на У ад Расонаў, 198 *км* ад Віцебска, 18 *км* ад чыг. ст. Клясціца (РСФСР). 351 ж., двароў 109 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, адцд. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Ням.-фаш. захопнікі спалілі 16 двароў, загубілі 29 мірных жыхароў вёскі. 2 помнікі на брацкіх магілах аднаўскоўцаў і партызанаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАБО́РСКІ Пётр (сапр. Пётр Іванаў Заборскі; г. н. невяд.— 1665), беларускі і рускі майстар-цаніннік, чаканшчык і ювелір. У 1658—65 узначальваў арцель бел. майстроў (І. *Максімаў*, С. *Палубес*, Ф. Чука і інш.), якія стварылі вонкавае ўбранства і аздабленне інтэр'ера Васкрасенскага сабора Нова-Іерусалімскага манастыра (каля г. Істры) шматкаляровымі паліванымі кафлямі. Манастыр разбураны ням.-фаш. захопнікамі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАБРО́ДДЗЕ, вёска ў Мільчанскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоны Кастрычнік». За 64 *км* на ПнУ ад Вілейкі, 115 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Будслаў. 195 ж., двароў 58 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, адцд. сувязі, магазін. Помнік 33 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАБРО́ДЗІН Мікалай Фёдаравіч [н. 19.12.1905 (1.1.1906), в. Дуброўка Спаскага пав. Тамбоўскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1929. У Чырв. Арміі з 1927. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 15.12.1943 полк пад камандаваннем падпалкоўніка З. авалодаў участкам шашы каля в. Кузьміно Гарадоцкага р-на, перарэзаў камунікацыі праціўніка, адбіў некалькі контратак. За два дні падбіта 15 варожых танкаў, 40 аўтамашын. Жыве ў Дняпрапятроўску.

ЗАБРО́ДСКІ Сяргей Сцяпанавіч [н. 4(17).12.1911, г. Нясвіж Мінскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне гідрадынамікі і цепла-абмену. Чл.-кар. АН БССР (1966). Д-р тэхн. н. (1960), праф. (1964). Чл. КПСС з 1947. Удзельнік Айч. вайны. У 1939 скончыў энерг. ф-т Бел. політэхн. ін-та. Працаваў у энергасектары АН БССР, Ін-це энергетыкі АН БССР (1946—56). З 1956 у Ін-це цепла- і масаабмену АН БССР, з 1957 заг. лабараторыі. Чл. нацыянальнага к-та АН СССР па цепла- і масаабмене (з 1966), чл. рэдакцыйнага савета міжнар. час. «International Journal of Heat and Mass Transfer» («Цепла- і масаперанос»). Навук. працы і вынаходствы па цеплаабмене ў дысперсных сістэмах.



Тв.: Перенос тепла псевдоожиженным слоем зернистого материала, «Труды Ин-та энергетики АН БССР», М., 1958, в. 8; Гидродинамика и теплообмен в псевдоожиженном (кипящем) слое, М.— Л., 1963; Hydrodynamics and heat transfer in fluidized beds, Cambridge — London, 1966; Высокотемпературные установки с псевдоожиженным слоем, М., 1971.

ЗАБРО́ЗЗЕ, вёска ў Валожынскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Куйбышава. За 12 *км* на Пн ад Валожына, 87 *км* ад Мінска, 5 *км* ад чыг. ст. Валожын. 581 ж., двароў 185 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адцд. сувязі, сталовая, магазін. У жніўні 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, у 1942—43 загубілі 189 савецкіх грамадзян. Помнік 18 воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАБЫЧА́ННЕ, вёска ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Жадунька. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Забычанне». За 16 *км* на ПнЗ ад Касцюковіч, 166 *км* ад Магілёва, 14 *км* ад чыг. ст. Камунары. 415 ж., двароў 123 (1971). Пякарня, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, адцд. сувязі, магазін.

ЗАБЯЛЫ́ШЫНА (Забялышын), вёска ў Хоцімскім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Забялышына». За 20 *км* на ПнЗ ад Хоцімска, 160 *км* ад Магілёва, 39 *км* ад чыг. ст. Клімавічы, на аўтамаб. дарозе г. п. Хоцімск — в. Родня. 554 ж., двароў 199 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, адцд. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, сталовая, 2 магазіны. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАБЯРЭ́ЗІНСКІЯ, магнацкі род, асобныя прадстаўнікі якога адыгралі значную ролю ў дзярж. і паліт. жыцці Беларусі і Літвы.

Паходзіў ад Рымвіда, сын якога Юрый у 1-й пал. 15 ст. атрымаў у Ашмянскім пав. маёнткі Забярэзіна (адсюль прозвішча), Крывічы і Жасна. Займалі пасады намеснікаў полацкіх, крычаўскіх, ваўкавыскіх, навагрудскіх, валадаў троцкіх, маршалкаў літоўскіх. Апошні мужчынскі прадстаўнік З. памёр каля 1546, маёнткі перайшлі да кн. Збаражскага. Найб. вядомы з З. Ян Юр'евіч, намеснік полацкі, ваявода троцкі [1498—1505], намеснік гродзенскі. Забіты ў час паўстання Глінскіх.

А. П. Грыцкевіч. Мінск.

ЗАВАДО́К, вёска ў Мхініцкім с/с Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Каўпіта. Цэнтр саўгаса «Завадоцкі». За 27 *км* на Пд ад Краснаполля, 160 *км* ад Магілёва, 79 *км* ад чыг. ст. Крычаў. 176 ж., гасп. 51 (1971). Рамонтная майстэрня, магазін.

ЗАВАДО́ЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч [8(21).11.1900, с. Пчалінаўка Баброўскага пав. Варонежскай губ.— 30.1.1960], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1928. У Чырв. Арміі з 1918. 8-ы гвардз. стралк. корпус пад камандаваннем ген.-л. З. вызначыўся ў час Беларускай аперацыі 1944 пры вызваленні Оршы, Барысава, Мінска, фарсіраванні Нёмана.

ЗАВА́ДСКАЯ СЛАБА́ДА, вёска ў Хонаўскім с/с Магілёўскага р-на, каля р. Арлянкі (0,5 *км*). Цэнтр саўгаса «Барок». За 35 *км* на ПдЗ ад Магілёва, 3 *км* ад чыг. ст. Вендрыж. 281 ж., гасп. 98 (1971). Клуб, б-ка, дзіцячы сад, адцд. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, сталовая, магазін. 2 помнікі: 239 зем-

лякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і 28 сав. грамадзянам, якіх у чэрв. 1941 загубілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАВА́ДСКІ (Zawadzki) Аляксандр (16.12.1899, г. Бендзін — 7.8.1964), дзеяч польскага рабочага руху, парт. і дзярж. дзеяч Польшчы. З сям'і металурга. З 1923 чл. Камуніст. рабочай партыі Польшчы (з 1925 кампартыя Польшчы — КПП). У 1925 чл. сакратарыята ЦК камсамола Зах. Беларусі. За рэвалюц. дзейнасць пяраз быў зняволены (1925, 1934, 1936; прабыў у турмах 11 гадоў). У час 2-й сусв. вайны быў у СССР. Удзельнічаў у абароне Сталінграда. Адзін з арганізатараў Саюза польскіх патрыётаў (1943) і Войска Польскага (1944). У 1944 старшыня Цэнтр. бюро камуністаў Польшчы ў СССР. У жн. 1944—снеж. 1948 чл. Палітбюро ЦК Польскай рабочай партыі, з снеж. 1948 чл. Палітбюро ЦК ПАРП і да 1954 сакратар ЦК ПАРП. З ліст. 1952 старшыня Дзярж. Савета ПНР, з 1956 адначасова старшыня Усяпольскага камітэта Фронту адзінства народа.



ЗАВА́ДСКІ Уладзімір Георгіевіч (н. 13.1.1919, Орша), Герой Сав. Саюза (1944). З рабочых. Чл. КПСС з 1940. Скончыў Энгельскае ваен.-авіяц. вучылішча (1940), Харкаўскі інж.-эканам. ін-т (1956). У Чырв. Арміі з 1939. У Айч. вайну ў бамбардзіровачнай і разведвальнай авіяцыі на Зах., Сцяпным, 2-м Укр. франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, на Курскай дузе, Украіне, у Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі. Зрабіў 152 баявыя вылеты, у т. л. 115 на разведку варожых войск і глыбокіх тылоў. Жыве ў Первамайскім Мікалаеўскай вобл.

ЗАВА́ДСКІ Юрый Аляксандравіч [н. 30.6(12.7).1894, Масква], рускі савецкі рэжысёр, акцёр, педагог. Нар. арт. СССР (1948). Праф. (1947). Чл. КПСС з 1944. Творчую дзейнасць пачаў у 1915 у студыі Я. Вахтангава. У 1924—31 акцёр МХАТа. У 1924 заснаваў студыю (з 1927 Тэатр-студыя З.). З 1940 гал. рэж. Маск. т-ра імя Массавета. Пастаноўкам З. ўласцівыя псіхал. тонкасць і яркая тэатр. форма. Спектаклі: «Мсціслаў Удалы» І. Прута (1932), «Гібель эскадры» А. Карнейчука (1934), «Утаймаванне свавольніцы» У. Шэкспіра (1938), «Шынкарка» К. Гальдоні (1940), «Далі неаглядныя» М. Вірты (1957), «Маскарад» М. Лермантава (Ленінская прэмія 1965), «Злачынства і кара» паводле Ф. Дастаеўскага (1969). Дзярж. прэміі СССР 1946, 1951. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Об искусстве театра, М., 1965.

ЗАВА́ЙЦЬ, вёска ў Нараўлянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны баец». За 8 *км* на З ад Нароўлі, 186 *км* ад Гомеля, 20 *км* ад чыг. ст. Ельск, на аўтамаб. дарозе Нароўля — в. Дабрынь. 710 ж., гасп. 211 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 17 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАВАЛО́ЧЫЦЫ, вёска ў Глускім р-не Магілёўскай вобл., на р. Пціч. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Завалочыцы». За 33 *км* на Пн ад Глуска, 150 *км* ад Магілёва, 25 *км* ад чыг. ст. Старыя Дарогі, каля шашы Бабруйск — Слуцк (1 *км*). 663 ж., гасп. 213 (1971). Пякарня, спірт. з-д, сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, адда. сувязі, сталовая, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле 80 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ЗАВА́РЗІН Аляксей Аляксеевіч [13(25).3.1886, Пецярбург — 25.7.1945], савецкі гісталаг, адзін з заснавальнікаў эвалюцыйнага кірунку ў гісталогіі. Акад. АН СССР (1943), акад. АМН СССР (1944). Скончыў фіз.-матэм. ф-т Пецярбургскага ун-та (1907). З 1916 праф. Пермскага ун-та, у 1922—36 праф. Ваенна-мед. акадэміі. У 1932—45 кіраўнік п.-д. установы і кафедраў гісталогіі ў Ленінградзе і Маскве. Асн. працы па параўнальнай гісталогіі нерв. сістэмы, крыві і злучальнай тканкі. Аўтар тэорыі паралелізмаў у эвалюцыі тканак. Распрацаваў метад вывучэння злучальнай тканкі пры асептычным запаленні і мышачнай тканкі ва ўмовах рэгенерацыі. Дзярж. прэмія СССР 1942.



Тв.: Избранные труды, т. 1—4, М.— Л., 1950—53; Очерки эволюционной гистологии крови и соединительной ткани, в. 1—2, М.— Л., 1945—47.

Літ.: Абрикосов А. И. Алексей Алексеевич Заварзин, «Вестник Академии медицинских наук СССР», 1946, № 1; Алексей Алексеевич Заварзин, «Архив анатомии, гистологии и эмбриологии», 1948, т. 28, № 1.

ЗАВАРО́Т КІШАК, тое, што *непраходнасць кішэчніка*.

ЗАВАРЫЗГІН Барыс Сяргеевіч (н. 5.6.1921, Масква), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1943, лётчык-штурмавік. Вызначыўся ў час Беларускай аперацыі 1944. Удзельнічаў у штурме глыбокаэшаланаванай абароны праціўніка на рубяжы Віцебск — Орша, у вызваленні Мінска і ліквідацыі фашысцкай групоўкі ў мінскім «катле». 23—26.8.1944 знішчыў 2 танкі, 4 бронетранспарцёры, 9 гармат, 23 аўтамашыны і шмат інш. тэхнікі праціўніка. Жыве ў Маскве.

ЗАВЕ́Р'Е, вёска ў Слабодкаўскім с/с Браслаўскага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Ільмёнак. Цэнтр калгаса «Радзіма». За 12 *км* на ПнУ ад Браслава, 227 *км* ад Віцебска, 22 *км* ад чыг. ст. Друя, каля шашы Браслаў — Друя (2 *км*). 220 ж., гасп. 72 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка. Помнік 18 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАВЕРТАЛЮ́К Якаў Гаўрылавіч (27.11.1921, Уманскі пав. Кіеўскай губ.— 14.12.1969), удзельнік баёў па Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся па тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. У ноч на 27.9.1943 на чале аддзялення пераправіўся цераз Дняпро і ўварваўся ў варожыя траншэі. Захоплены плацдарм утрымліваў да падыходу асн. сіл, адбіўшы 4 контратакі.

ЗАВЕ́РША, вёска ў Бездзежскім с/с Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзімітрова. За 20 *км* на ПнУ ад Драгічына, 130 *км* ад Брэста, 24 *км* ад чыг. ст. Янаў-Палескі. 661 ж., гасп. 178 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, адда. сувязі, магазін. Помнік 131 земляку, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАВЕ́РЫНА, вёска ў Веляшковіцкім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 17 *км* на Пн ад Лёзна, 57 *км* ад Віцебска, 19 *км* ад чыг. ст. Лёзна. 90 ж., гасп. 28 (1971). Клуб, б-ка, магазін. У 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

«ЗАВІВА́ННЕ БАРА́ДЫ», старадаўні ўсходнеславянскі звычай у час дажынак. Жнеі пакідалі некалькі пязжатых каласоў, перавязвалі іх чырвонаю стужкаю — рабілі «бараду», побач клалі хлеб, соль, вакол вадзілі карагоды, спявалі жніўныя песні. Лічылася, што ў пязжатым каліве каласоў будзе мець прыстанішча «гаспадар» поля — *жыцень*. Звычай бытаваў па Беларусі да пач. 20 ст.

ЗАВІДА́ЎКА, вёска ў Ленінскім с/с Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Чкалава. За 55 *км* на ПдУ ад Добруша, 83 *км* ад Гомеля. 27 *км* ад чыг. ст. Церахоўка. 528 ж., двароў 204 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін.

ЗАВІДЗІНЕ́НТЫ, вёска ў Міхалішскім с/с Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Зара». За 40 *км* на ПнУ ад Астраўца, 320 *км* ад Гродна, 45 *км* ад чыг. ст. Гудагай. 173 ж., гасп. 56 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін.

ЗАВІРУ́ШКІ, **завірушкавыя** (Prunellidae), сямейства птушак атр. вераб'іных. 12 відаў. Пашыраны ва ўмеранай палосе Еўропы і Азіі, а таксама ў Паўн. Афрыцы. У СССР 8 відаў, на Беларусі адзін — лясная З. (Prunella modularis).



Завірушка лясная.

Даўж. цела відаў З., пашыраных у СССР, да 18,5 см. Аплрэнне густое, цвёрдае, шараватае, бурае, у многіх з плямаю на гарляку. Лясная З. асцярожная, малапрыкметная пералётная птушка. Жыве ў лясах з густым падлескам. Гняздуецца на вялмі ці ў кустах. Лясе 2 разы на год па 5—6 лец, наседжвае каля 12 дзён. Корміцца насякомымі і насеннем травяністых раслін.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.); Птицы Советского Союза, т. 6, М., 1954.

Р. К. Кажэўнікава. Мінск.

ЗАВІТНЕ́ВІЧ Уладзімір Зянонавіч [2(14).4.1853, в. Літвяны Мінскага пав.— сак. 1927], беларускі археолаг. Праф. Кіеўскай духоўнай акадэміі (1904). З сям'і свяшчэнніка. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1878). Працаваў настаўнікам у Варшаве, з 1884 у Кіеўскай духоўнай акадэміі. Даследаваў каля 700 курганоў дрыгавічоў у 82 могільніках, найбольш у Мазырскім, Рэчыцкім і Бабруйскім пав. Мінскай губ. Вызначыў межы расселення дрыгавічоў, іх этнаазначальныя прадметы. Вывучаў стараж.-рус. гісторыю.

Тв.: Область дреговичей как предмет археологического исследования, у кн.: Труды Киевской духовной академии, кн. 8, Киев, 1886; Из археологической экскурсии в Припятское Полесье, Киев, 1890; Вторая археологическая экскурсия в Припятское Полесье, Киев, 1891; Формы погребального обряда в могильных курганах Минской губ., у кн.: Труды IX археологического съезда в Вильне, т. 1, М., 1895.

П. Ф. Лысенка. Мінск.

ЗАВІШЧА́НСКАЕ, воз. ў бас. Піны, левага прытока Прыпяці, у Іванаўскім р-не Брэсцкай вобл. Пл. 1,3 *км*². Даўж. 1,7 *км*, найб. шыр. 1 *км*, сярэдняя 0,7 *км*. Катлавіна авальная, злёгку выцягнутая з Пн на Пд. Схілы спадзістыя, парослыя лесам і хмызняком; на заходніх ворныя землі. Берагі пераважна нізкія, забалочаныя. Вадазбор нізінны, забалочаны. Возера зарастае; праточнае, з Пд упадае канал, сцёк у р. Піну. Водзяцца лешч, плотка, шчупак, акунь, карась, жэрах, джгір.

ЗАВІШЫ́НА, вёска ў Нястанавіцкім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 44 *км* на ПнЗ ад Лагойска, 84 *км* ад Мінска, 52 *км* ад чыг. ст. Вілейка, каля шашы г. Вілейка — г. п. Плешчаніцы (2 *км*). 203 ж., двароў 60 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 78 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАВО́Д, прамысл. прадпрыемства. У палітэканоміі тое, што і *фабрыка*.

Першапачаткова між імі была розніца ў характары апрацоўкі: механічная — на заводах і хімічная — на ф-ках. З развіццём навукі і тэхнікі на З. і на ф-ках ужываецца мех. і хім. апрацоўка. Але па традыцыі адны прамысл. прадпрыемствы, пераважна машынабудавання і металаапрацоўкі, называюць З., другія, пераважна лёгкай прамысловасці,— ф-камі.

ЗАВО́ДСКАЯ ЛАБАРАТО́РЫЯ, установа на прамысл. прадпрыемствах, якая ажыццяўляе лабараторны кантроль, выконвае навукова-даследчыя і эксперым.-вытворчыя работы.

Адрозніваюць: цэнтральную, або агульназаводскую (кіруе ўсімі З. л., падпарадкоўваецца гал. інжынеру з-да), групавую (абслугоўвае цэхі, звязаныя паслядоўнасцю выт. працэсу), цэхавую (абслугоўвае асобныя цэхі) і экспрэс-лабараторыю (лабараторыя паскоранага аналізу). Асн. функцыі: тэхнал. кантроль, даследчая работа па ўдасканаленні тэхнал. працэсаў, паляпшэнні якасці прадукцыі, пытанні ўнутрызаводскага гасп. разліку, планавання, арг-цыі працы і кіравання і інш. На 1.1.1971 на прамысл. прадпрыемствах БССР было 1403 лабараторыі.

ЗАВО́ЛЬША, вёска ў Лёзненскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 9 *км* на ПдУ ад Лёзна, 50 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Завольша, каля шашы Віцебск — Смаленск (3 *км*). 220 ж., гасп. 75 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, сталовая, магазін. У 1943 нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску.

ЗАВО́ЧНАЕ НАВУЧА́ННЕ, адна з формаў падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй, а таксама агульнаадук. падрыхтоўка за курс сярэдняй школы без адрыву ад працоўнай дзейнасці. У СССР З. н., як і *вячэрняе навучанне,*— частка агульнай сістэмы нар. асветы. Агульнаадук. завочныя школы забяспечваюць падрыхтоўку ў аб'ёме васьмігадовай і сярэдняй школы. Сярэдняе спец. З. н. ажыццяўляецца завочнымі аддз. стацыянарных тэхнікумаў і вучылішчаў і завочнымі тэхнікумамі. У вышэйшым З. н. пераважнае развіццё набыла вышэйшая пед. і вышэйшая тэхн. адукацыя. З. н. прадугледжвае ў аснoўным павысіць кваліфікацыю спецыялістаў, якія працуюць па адпаведнай ці блізкай спецыяльнасці. Арганізацыю З. н., як і дзённага і вячэрняга, ажыццяўляюць мін-вы і ведамствы, якім падпарадкоўваюцца навуч. ўстановы. Метадычнай работай кіруюць саюзнае і рэсп. мін-вы вышэйшай і сярэдняй спец. адукацыі. Формы З. н.: лекцыі, кансультацыі, семінары і практ. заняткі, якія ў час лабараторна-экзаменацыйных сесій праводзяцца ў навуч. установах, іх філіялах ці на кансультацыйных пунктах, а таксама кантрольныя работы і самастойнае вывучэнне л-ры. Па прадметах, якія вывучаюцца, студэнты-завочнікі здаюць залікі і экзамены. У час лабараторна-экзаменацыйных сесій яны карыстаюцца дадатковым водпускам з захаваннем заработнай платы. Асобы, якія паспяхова вучацца без адрыву ад вытворчасці ў завочных агульнаадук. сярэдніх школах, маюць скарочаны рабочы дзень ці скарочаны рабочы тыдзень. Выпускнікі завочных навуч. устаноў карыстаюцца аднолькавымі правамі з выпускнікамі дзённых і вячэрніх навуч. устаноў.

У дарэвалюц. Расіі З. н. як форма *самаадукацыі* пачало развівацца ў 2-й пал. 19 ст. Ствараліся завочныя, пераважна агульнаадук. курсы, ініцыятарамі якіх былі прагрэс. педагогі, перадавыя вучоныя і культ.-асветныя т-вы. Пасля Кастр. рэвалюцыі З. н. пашыраецца ва ўсіх звенніх нар. асветы. З 1918 ствараюцца завочныя курсы па розных спецыяльнасцях, з 1926 завочныя аддз. ВНУ, з 1929 завочныя аддз. тэхнікумаў, з 1931 завочныя ін-ты. У БССР першыя завочныя аддз. адкрыты ў 1931 пры Мінскім, Віцебскім і Магілёўскім пед. ін-тах, у 1933 пры Бел. політэхн. ін-це; арганізаваны *Беларускі інстытут масавага завочнага навучання партактыву* пры ЦК КП(б)Б (1931—38). У пасляваен. гады завочная сістэма навучання ўдасканальваецца.

У 1970 у БССР навуч. ўстановы мелі 21 завочнае аддз. і ф-ты, у 15 гарадах працавалі 27 навуч.-кансультацыйных пунктаў ВНУ Беларусі і 17 саюзных ВНУ. У БССР у 1970/71 навуч. г. на завочных аддз. і ф-тах ВНУ навучалася 44 800 чал., у завочных сярэдніх спец. навуч. установах 40 700 чал. Гл. таксама *Сярэдняя адукацыя, Сярэдняя спецыяльная адукацыя, Вышэйшая адукацыя.*

М. І. Красоўскі. Мінск.

ЗАВЎЛІН Іван Аляксандравіч (н. 16.1.1923, в. Лянькова Лыскаўскага пав. Ніжагародскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся ў Камарынскім р-не Палескай вобл. У вер. 1943 у складзе групы байцоў пад агнём праціўніка фарсіраваў Дняпро і атакаваў ворага. Жыве ў Горкім.

ЗАВУ́ЦЦЕ, вёска ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., каля р. Авута (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Сцяг перамогі». За 55 *км* ад ПдУ ад Міёраў, 155 *км* ад Віцебска, 28 *км* ад чыг. ст. Зябкі, каля аўтамаб. дарогі Дзісна—в. Лужкі (0,5 *км*). 428 ж., гасп. 142 (1970). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік савецкім воінам і партызанам, якія загінулі ў Айчынную вайну.

ЗАВЯДА́ННЕ, 1) фізіялагічны працэс, які выклікаецца нястачай вады ў органах расліны (гл. *Водны рэжым раслін*). 2) Хвароба раслін, абумоўленая стратай тургару ва ўсёй расліне, у паасобных органах ці іх частках. Выклікаецца грыбамі (фузарыёзнае і вертыцыліёзнае З.), фітапатагеннымі бактэрыямі (бактэрыяльнае З.), узнікае ад некат. неспрыяльных вонкавых фактараў (нястачы вільгаці, высокая т-ра і інш.).

Інфекцыя трапляе ў расліну праз ранкі, трашчыны, месцы пашкоджання насякомымі або праз вадзяныя поры і вусцейкі. У выніку гэтага парушаецца дзейнасць сасудзістай сістэмы і расліна траціць тургар. Прыкметы З.: панікласць і павіслаць лісця, галінак, суквецця, засыханне і ападанне лісця, пачарнеласць сасудаў. Узбуджальнікі хваробы перадаюцца праз глебу, насенны і пасадачны матэрыял, а таксама слізнякамі, нематодамі, блохамі. На Беларусі З. выяўлена на лёне, лубіне, гаросе, бобе, капусце, таматах, бульбе. Меры барацьбы: правільная агратэхніка, захаванне севазвароту, пратручванне насення, культываванне ўстойлівых сартоў.

Літ.: Пересыпкин В. Ф. Сельскохозяйственная фитопатология, М., 1969.

Б. М. Прусакова. Мінск.

ЗАВЯЧЭ́ЛЛЕ, вёска ў Мосарскім с/с Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Чырвоная Полаччына». За 12 *км* на ПдУ ад Ушачаў, 140 *км* ад Віцебска, 31 *км* ад чыг. ст. Лепель, каля шашы Полацк—Лепель (1 *км*). 313 ж., гасп. 98 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аддз. сувязі, магазін.

ЗАВЯШЧА́ННЕ, распараджэнне грамадзяніна ў вызначанай законам форме пра асобую маёмасць на выпадак яго смерці.

Паводле сав. права кожны дзездольны грамадзянін можа скласці З. на карысць любой асобы (ці некалькіх асоб), а таксама дзяржавы або грамадскіх арг-цый. Завяшчальнік не можа пазбавіць непаўналетніх ці непрацаздольных дзяцей, бацькоў, мужа або жонкі, утрыманцаў частку *спадчыны* (⅔), якая належала б ім паводле закону. Завяшчальнік можа ўскласці на наследніка выкананне якога-н. абавязацельства, карысць адной ці некалькіх асоб (даць магчымасць пажыццёва карыстацца жыллём, выдаваць сродкі на ўтрыманне і г. д.) або на ажыццяўленне грамадскага карыснай мэты. Завяшчальнік мае права ў любы час замяніць З. новым. У гэтым выпадку сапраўдным прызнаецца апошняе. З. сапраўдным тады, калі падпісана завяшчальнікам і патаемкана засведчана. У асобных выпадках, прадугледжаных законам, З. можа засведчыць не патарыус, а службовая асоба (сав. консул, камандзір ваен. часці, капітан судна, гал. ўрач бальніцы і інш.).

Літ.: Гл. пры арт. *Спадчына.*

В. С. Юрчанка. Мінск.

ЗАГАВО́ЛІНА, гарадзішча *днепра-дзвінскай культуры* і тыпу верхняга пласта *Банцараўскага гарадзішча* каля в. Загаволіна Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Вядома з 1873, даследаваў К. П. Шут (1966). Пры раскопках знойдзены жал. прылады працы, слабапрафіляваныя гаршкі і слоікападобныя пасудзіны, гліняныя прасліцы, выяўлены рэшткі доўгіх жытлаў слупавой канструкцыі, косці дзікіх і свойскіх жывёл.

Літ.: Шут К. П. Городище Заговалино Ушачского района, у кн.: Вопросы истории, Мн., 1969.

ЗАГА́Д, 1) адм. акт савецкага дзярж. кіравання, які выдаецца кіраўніком прадпрыемства, цэнтральнага, мясцовага або галіновага органа кіравання ў межах дадзеных паўнамоцтваў на аснове і для выканання законаў, указаў Прэзідыума Вярх. Савета, пастаноў і распараджэнняў урада, міністэрстваў, ведамстваў, рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных і іх выканаўчых камітэтаў. 2) З. вайсковы, вуснае або пісьмовае распараджэнне начальніка, якое з'яўляецца для падначаленага законам і павінна быць дакладна і бясспрэчна выканана.

ЗАГА́Д № 1 ВЫКАНКО́МА МІНСКАГА САВЕ́ТА «Да насельніцтва гор. Мінска і ваколіц», першы заканадаўчы дакумент, які абвясціў Савецкую ўладу ў Мінску. Надрукаваны і распаўсюджаны сярод насельніцтва горада да 2 гадзін дня 25.10(7.11). 1917. У ім паведамлялася ад імя выканкома Савета, што ўлада ў Мінску перайшла ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і што Савет прыняў самыя строгія меры для аховы рэвалюц. парадку. Апублікаваны ў газ. «Буревестник» № 17(52) 27.10.1917. Іл. гл. ў арт. *Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.*

ЗАГА́ДКА, жанр фальклору, іншасказальнае вобразнае апісанне прадмета або з'явы, якія трэба адгадаць.

Узніклі ў старажытнасці. Змест З.— прырода і яе з'явы, жывёльны і раслінны свет, чалавек, яго прац. дзейнасць і духоўнае жыццё. Вызначаюцца прадметнасцю, канкрэтнасцю і рэалізмам, афарыстычнасцю, трапнасцю, вобразнай мовай, багатым гукапісам, разнастайнай рытмікай. Метафарычныя і алегарычныя З. аб прыродзе найб. старадаўнія. З.— не заўсёды метафара. Не менш частым формы — каротkае апісанне або сціслы расказ, З.-пытанні, З.-задачы. Захаваўшы ранейшыя функцыі (выпрабаванне мудрасці, развіццё мыслення, кемлівасці, паэт. погляду на рачаіснасць, пазнанне свету ў вобразнай мастацкай форме, прадмет забавы і г. д.), З. жыве ў наш час. Есць З. літаратурныя — арыгінальныя і складзеныя на аснове фальклорных (Г. Леўчык, Н. Гілевіч, В. Зуёнак і інш.).

Публ.: Романов Е. Р. Белорусский сборник, в. 1—2, Киев, 1886; Никифоровский Н. Я. Простонародные загадки, Витебск, 1898; Federowski M. Lud białoruski, t. 4, Warszawa, 1935.

Літ.: Карский Е. Ф. Белорусы, т. 3, ч. 1, М., 1916; Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць, Мн., 1967; Праблемы сучаснага беларускага фальклору, Мн., 1969. *А. І. Гурскі.* Мінск.

ЗАГА́ЙНАЎ Васіль Фёдаравіч [1(14).1.1903, в. Лапаўцы Царовакакшайскага пав. Казанскай губ.— 4.10.1943], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1942. Вызначыўся ў Брагінскім р-не Палескай вобл. 4.10.1943 кулямётчык З. стрымліваў наступленне ворага на правым беразе Дняпра. Загінуў у баі. Школа ў в. Піркі Брагінскага р-на Гомельскай вобл. названа яго імем.

ЗАГА́ЙНАЎ Георгій Пракопавіч (н. 21.9. 1922, в. Шэклянур Царовакакшайскага пав. Казанскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. Камандзір сапёрнага ўзвода З. у вер. 1943 забяспечыў паспяховую пераправу часцей і ў ліку першых фарсіраваў раку.

ЗАГА́ЛЛЕ, вёска ў Соснаўскім с/с Любанскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Загальскі». За 30 *км* на ПдУ ад Любані, 182 *км* ад Мінска, 55 *км* ад чыг. ст. Урэчча. 423 ж., двароў 102 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, сталовая, магазін. У ліст. 1943 ням.-фаш. захопнікі загубілі 45 мірных жыхароў вёскі (паводле ўдакладненых звестак).

ЗАГА́ЛЬСКІ МАСІ́Ў, балота нізіннага тыпу ў Любанскім р-не Мінскай вобл. Размешчана на ПдУ ад Любані на левабярэжжы р. Арэсы. Утварылася ад забалочвання лёгкіх пясчаных глебаў пры разводдзях Арэсы і грунтавой вадой. Пл. 32,5 тыс. *га*. Пл. прамысл. пакладаў торфу 20,7 тыс. *га*, магутнасць пласта ў сярэднім 1,75 *м*. Складзена ўнізе з трыснягова-асаковага, трыснягова-асаковага, зверху — з асаковага ці асакова-гіпнавага торфу. На З. м. 3 возеры, найбольшае з іх Вячэра. Асн. плошча меліяраванага масіву асушана і выкарыстоўваецца пад ворыва.

ЗАГА́Р, змена колеру скуры ад празмернага ўтварэння ў яе паверхневым слоі пігменту меланіну.

Бывае ад дзеяння ультрафіялетавых і інфрачырвоных прамянёў сонца або штучных крыніц святла (ртутная кварцавая лямпа, эл. дуга і інш.). З.— ахоўная рэакцыя арганізма ад лішку сонечнай радыяцыі. Дзеянне сонечных прамянёў у сярэдніх дозах выклікае лёгкі З., станоўча ўплывае на арганізм, паляпшае жыўленне скуры, павялічвае ў ёй колькасць вітаміну D, павышае супрацьляльнасць арганізма да інфекцыйных хвароб і інш. Доўга быць на сонцы шкодзіць здароўю. Гл. *Апёк.*

Літ.: Ефимов В. В. и Грандковская И. А. Солнце и здоровье, М., 1957; Данилова Н. А. Природа и наше здоровье, М., 1971.

ЗАГАРА́ДНА, вёска ў Глоданскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 30 *км* на Пн ад Лёзна, 69 *км* ад Віцебска, 32 *км* ад чыг. ст. Лёзна. 244 ж., гасп. 88 (1971). Клуб, б-ка, магазін. У 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАГАРА́НКІ, вёска ў Лясянскім с/с Круглянскага р-на Магілёўскай вобл., на р. Вабіч. Цэнтр калгаса «50 гадоў Кастрычніка». За 10 *км* на У ад Круглага, 65 *км* ад Магілёва, 30 *км* ад чыг. ст. Талачын. 143 ж., гасп. 48 (1971). Сепаратарны пункт. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, 3 магазіны.

ЗАГАРО́ДДЗЕ, платонадобная ледавіковая раўніна на ПдУ БССР, у міжрэччы Піны і Ясельды; фізіка-геагр. раён беларускага Палесся. Ад Пінска працягнулася клінам, які пашыраецца на ПнЗ да лініі Бяроза — Пружаны. Пераважаюць выш. 150—160 *м* над узр. м. Над прылеглымі балотамі прыўзнята на 10—20 *м*. У восевай частцы З. выдзяляюцца

марэнныя ўзгоркі перарывістай градою, выш. да 173 *м*. Трапляюцца дзюнна-ўзгорыстыя ўчасткі, на ўскраіне З. ступені надпойменных тэрас. Карысныя выкапні: цагельная гліна, мел, мергель, буд. пяскі. Глебы дзярнова-падзолістыя супясчаныя і суглінкавыя, у далінах і катлавінах дзярнова-аглееныя і тарфяна-балотныя. Пад лесам менш за 20% тэр. Пераважаюць лясы хваёвыя, хваёва-шыракалістыя, месцамі мяшаныя з драбналістымі пародамі. Пад с.-г. ўгоддзямі каля 35% тэр., пад лугамі і пашаю каля 40%. Вырошчваюцца збожжавыя, бульба, цукр. буракі, лён.

В. А. Дзяменцьеў. Мінск.

ЗАГАРО́ДНЕЎ Васіль Іванавіч (29.12.1919, в. Лох Саратаўскага пав.— 31.7.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Брэсцкай вобл. 31.7. 1944 рота на чале з З. фарсіравала Зах. Буг, захапіла плацдарм каля в. Зачэпкі па З ад Брэста, адбіла 4 контратакі праціўніка, знішчыла 2 танкі, 4 гарматы, 70 аўтамашын. Загінуў у баі. Пахаваны ў Брэсце. Яго імем названа вуліца ў Брэсце.

ЗАГАРТО́ЎВАННЕ АРГАНІ́ЗМА, павышэнне ўстойлівасці арганізма і выхаванне здольнасці прыстасоўвацца да шкоднага ўплыву метэаралагічных фактараў (холаду, высокай т-ры, вільготнасці і інш.) без функцыян. расстройстваў. Дасягаецца рац. выкарыстаннем сонечных, паветраных, водных працэдур. Гл. таксама *Клімататэрапія.*

ЗАГАРТО́ЎКА (у тэхніцы), від тэрмічнай апрацоўкі, якая вядзе да замацавання т. зв. нераўнаважнага структурнага стану матэрыялу, не ўласцівага гэтаму матэрыялу пры нармальнай т-ры. Робіцца награваннем і наступным хуткім ахаладжэннем. Загартоўваць можна многія рэчывы — неарганічныя (напр., шкло) і арганічныя. Найб. выкарыстанне ў прамысловасці мае З. метал. сплаваў. З. павялічвае пругкасць, трываласць і цвёрдасць сталі, павялічвае пластычнасць многіх каляровых сплаваў.

З. сталі адбываецца нагрэвам да т-р у інтэрвале фазавых пераўтварэнняў (гл. *Фазавы пераход*) ці вышэй, вытрымкай пры гэтых т-рах і наступным ахаладжэннем са скорасцю, большай за крытычную ў інтэрвале найменшай устойлівасці пераахаладжанага *аўстэніту.* Здольнасць сталі загартоўвацца і патрэбная для гэтага т-ра вызначаюцца па *дыяграме стану,* а залежнасць структуры ад скорасці ахаладжэння — з тэрмакінетычных крывых. Асн. структура загартаванай сталі — *мартэсіт.* У некат. сталях у структуры пасля З. разам з мартэнсітам ёсць значная колькасць астаткавага аўстэніту. Пры скорасці ахаладжэння, ніжэйшай за крытычную, аўстэніт распадаецца на феритнацэментытную сумесь (*перліт,* сарбіт ці троастыт). Ад звычайнай З. ў дэталях узнікаюць унутр. напружанні і адбываецца карабачанне гэтых дэталяў. Каб пазбегнуць гэтых недахопаў, практыкуюць розныя спосабы З. Перарывістая З., падобная да звычайнай па ўмовах награву, адбываецца ступовым ахаладжэннем на паветры ці ў масле. Выкарыстоўваецца для вял. дэталяў і інструменту. Ступеньчатая З. робіцца ахаладжэннем сталі ў аўстэнітным стане, вытрымкай і наступным павольным ахаладжэннем у інтэрвале мартэнсітнага пераўтварэння. Ужываецца для дэталяў перамеснага сячэння. Ізатэрмічная З. ажыццяўляецца ахаладжэннем сталі ў аўстэнітным стане і ізатэрмічнай вытрымкай да поўнага распаду аўстэніту. Выкарыстоўваецца для інструменту, шасцерняў, дэталяў шарыкападшыпнікаў. Пашыраны т. зв. паверхневая З., якая робіцца з дапамогай *індукцыйнага нагрэву;* структура пасля такой З.— дробнаігольчасты мартэнсіт — толькі на нязначнай глыбіні ў целе вырабу (1—5 *мм*). Асн. перавагі паверхневай З.: высокая скорасць працэсу, магчымасць аўтаматызацыі, паменшаная працаёмкасць і нізкі сабекошт. Тэхналогію З. гл. ў арт. *Тэрмічная апрацоўка металаў.*

Літ.: Бочвар А. А. Металловедение, 5 изд., М., 1956; Болховитинов Н. Ф. Металловедение и термическая обработка, 6 изд., М., 1965; Гуляев А. П. Металловедение, 4 изд., М., 1966; Курдюмов Г. В. Явления закалки и отпуска стали, М., 1960.

А. С. Матусевіч, Мінск.

ЗАГА́ЦЦЕ, вёска ў Валкалацкім с/с Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «XIX партз'езд». За 37 *км* на З ад Докшыц, 230 *км* ад Віцебска, 26 *км* ад чыг. ст. Параф'янава. 99 ж., гасп. 30 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, адз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

«ЗАГЛЯНЕ СО́НЦА І У НАША АКО́ШКА», першая беларуская легальная выдавецкая суполка (таварыства). Засн. 5.5.1906 у Пецярбурзе з асветніцкай мэтай па ініцыятыве Б. *Эпімаха-Шыпілы* на каап. асновах групай перадавой інтэлігенцыі. Нягледзячы на цяжкае фін. становішча, адсутнасць палігр. базы (усе кнігі друкаваліся ў польскай друкарні К. Л. Пяткоўскага), цэнзурныя рэпрэсіі (арышт зборнікаў «Жалейка» Я. Купалы, «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» Ф. Багушэвіча), выпусціла 38 назваў кніг агульным тыражом больш за 100 тыс. экз. (кнігі друкаваліся лацінкай і кірыліцай). Сярод іх першыя бел. падручнікі: «Беларускі лемантар, або першая навука чытання» К. Каганца, «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі, «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я. Коласа; творы Я. Купалы — «Жалейка», «Сон на кургане», «Шляхам жыцця»; Я. Коласа «Батрак»; Ц. Гартнага «Песні»; У. Галубка «Апавяданні»; З. Бядулі «Апавяданні» і інш., а таксама навук.-папулярныя брашуры. Наладзіла выданне падпіснога серыі «Беларускія песняры», у якую ўваходзілі творы В. Дуніна-Марцінкевіча («Гапон», «Вечарніцы», «Шчароўскія дажынкі», «Купала»), Ф. Багушэвіча («Дудка беларуская», «Смык беларускі»), пераклад А. Міцкевіча («Пан Тадэвуш»). Усе кнігі серыі «Беларускія песняры» выходзілі тыражом па 4300 экз. Каб папоўніць рэпертуар бел. муз.-драм. гурткоў, суполка выдала літаграфічным спосабам п'есы Я. Купалы, К. Каганца, А. Чохава, М. Крапіўніцкага, Э. Ажэшкі. Выпусціла больш за 20 відаў паштовак з краявідамі Беларусі, з партрэтамі бел. пісьменнікаў. Спыніла дзейнасць у 1914.

Літ.: Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць, Мн., 1968, с. 169—184; Яго ж. Пушкіны роднага слова, Мн., 1971, с. 131—165; Семашкевіч Р. М. Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Мн., 1969, с. 36—55.

С. Х. Александровіч. Мінск.

ЗАГО́ННАЯ ПАСЬБА́, спосаб рацыянальнага выкарыстання пашы, калі яе дзеляць на загоны, дзе па чарзе пасуць жывёлу. Адзін з асн. метадаў барацьбы з паразітозамі с.-г. жывёлы. За лета травастой спасваюцца 4—5 разоў. Пры З. п. павялічваецца ўраджайнасць пашы, забяспечваецца нармальнае аднаўленне травастою, паляпшаецца якасць корму.

За гуртом буйн. раг. жывёлы ў 100—120 галоў замацоўваюць участак пашы, які дзеляць на 12—15 загонаў па 3—4 *га.* На кожным загоне жывёлу пасуць 2—3 дні. Участак дзеляць так, каб з усіх загонаў быў праход да вадапою і лагера.

Літ.: Тоомре Р. П. Долголетние культурные пастбища, М., 1966; Лашкевич Г. И. Устройство, использование пастбищ на осуш. болотах и уход за ними, Мн., 1947.

Я. У. Рубэнка. Мінск.

ЗАГО́РНАЕ, вёска ў Нагорнаўскім с/с Клецкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Ульянава. За 10 *км* на ПдУ ад Клецка, 150 *км* ад Мінска, 12 *км* ад чыг. ст. Клецк, каля шашы Слуцк — Івацэвічы (1,5 *км*). 828 ж., двароў 290 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ЗАГО́РТАЧНАЯ МАШЫ́НА, аўтамат ці паўаўтамат, які загортвае фасонныя вырабы паштучна (цукеркі, мыла і інш.) ці пэўную колькасць іх (пячэнне, цукар, цыгарэты).

Разнастайнасць спосабаў загорткі (у перакрутку, абціскannем, у «пасок», бандэроліо) наменклатуры вырабаў і пакавальных матэрыялаў (папера, цэлафан, фольга) абумовіла стварэнне З. м. розных канструкцый і прадукцыйнасці. Звычайна З. м. складаецца з загортачнага механізма і механізмаў падачы вырабаў і пакавальных матэрыялаў. Выкарыстоўваецца як самастойны агрэгат ці як састаўная частка тэхнал. ліній. Найб. пашыраны ў харчовай, лёгкай прамысловасці.

Літ.: Карпов Ю. К. и др. Машины и автоматы для завертки кондитерских изделий, М., 1969; Аристов Д. В. и Новикова Ю. Д. Современные зарубежные заверточные машины для завертки карамели, конфет и шоколада. (Обзор), М., 1969.

ЗАГО́РЦЫ, гарадзішча *дзякоўскай культуры, днепра-дзвінскай культуры* і *штрыхаванай керамікі культуры* каля былой в. Загорцы Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. Даследавалі А. М. Ляўданскі, К. М. Палікарповіч (1933—34), Л. В. Аляксееў (1950), К. П. Шут (1966). Пры раскопках знойдзены гладкасценная, штрыхаваная, тэкст. кераміка, касцяныя пакаечнікі стрэлаў, гліняныя прасліцы, бронзавыя і жал. ўпрыгожанні, зерняцёрка, абгарэлае збожжа, крыцы і шлакі. Адносіцца да 5—4 ст. да н. э.— 1—2 ст. н. э.

Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины, у кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики, М., 1959 (Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции, [т.]1).

А. Р. Мітрафанаў. Мінск.

ЗАГО́РЦЫ, вёска ў Абухаўскім с/с Гродзенскага р-на, на правым беразе Нёмана. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 31 *км* на ПдУ ад Гродна, 18 *км* ад чыг. ст. Скідаль. 156 ж., гасп. 60 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ЗАГРАНІ́ЧНАЕ БЮРО́ ЦК РСДРП (ЗБЦК), агульнапарт. прадстаўніцтва ЦК РСДРП за мяжой. Утворана на пленуме ЦК РСДРП у жн. 1908 (Жэнева). Падпарадкоўвалася вузкаму саставу ЦК РСДРП у Расіі (пяцёркі). Функцыі ЗБЦК: трымаць сувязь з ЦК РСДРП у Расіі і з чл. ЦК, якія дзейнічалі за мяжой, кантраляваць замежныя групы садзеяння РСДРП, арганізоўваць фін. мерапрыемствы для партыі і атрымліваць паступленні ў касу ЦК, выдаваць і перапраўляць у Расію нелегальную л-ру. У Вільні, Гомелі, Гродне размяшчаліся канспіратыўныя пункты прыёму л-ры, у Мінску штаб-кватэра прадстаўніка ЦК РСДРП па транспарціроўцы парт. л-ры. Пасля студзеньскага (1910) пленума ЦК РСДРП у ЗБЦК умацаваліся ліквідатары і прымірэнцы, і яно заняло антыпарт. пазіцыі. 27.5.1911 большавікі заявілі пра разрыў з ЗБЦК і адклікалі свайго прадстаўніка. У студз. 1912 ЗБЦК самаліквідавалася.

Літ.: Ленін У. І. Гл. Даведачны т. да 4 выд. Тв. У. І. Леніна, ч. 1, Мн., 1963, с. 160—161 (Справочный т. к Полн. собр. соч. В. И. Ленина, ч. 1, с. 159—160); КПСС у рэзалюцыях і рашэннях з'ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК, ч. 1, Мн., 1954, с. 187—193, 206—210, 233—234, 238—239, 244—248, 250.

У. У. Зубец. Мінск.

ЗАГРАНІ́ЧНАЯ ЛІГА РУ́СКАЙ РЭВАЛЮЦЫ́ЙНАЙ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРА́ТЫІ, замежная арганізацыя рускіх сацыял-дэмакратаў. Створана па ініцыятыве У. І. Леніна ў Жэневе ў 1901. У яе ўвайшлі замежны аддзел арг-цыі «Искры» і «Зари», арг-цыя «Сацыял-дэмакрат», якая ўключала *групу «Вызваленне працы».* З'яўлялася замежным аддзелам арг-цыі «Искры», мела статут. Задачы лігі: пашырэнне марксізма, садзейнічанне стварэнню баявой рэвалюц. арг-цыі. II з'езд РСДРП (1903) прызнаў лігу адзінай арг-цыяй партыі за мяжой на правах мясцовага к-та, звёў яе паўнамоцтвы да садзеяння рус. рэвалюц. руху. Пасля II з'езду РСДРП стала меншавіцкай. Спыніла існаванне ў 1905.

Літ.: Ленін У. І. [«Аб'яднаўчы» з'езд заграничных арганізацый РСДРП. 21—22 вер. (4—5 кастр.) 1901 г.].— Загранічныя справы, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 5); Яго ж. [II з'езд Загранічнай лігі рускай рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыі. 13—18 (26—31) кастр. 1903 г.], Тв., т. 7 (там жа, т. 8).

У. У. Зубец. Мінск.

ЗАГС, гл. *Запіс актаў грамадзянскага стану.*

ЗАГУ́ЗЗЕ, вёска ў Віраўлянскім с/с Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл., на беразе воз. Бярнова. Цэнтр калгаса «Новае жыццё». За 40 *км* на ПнЗ ад Гарадка, 77 *км* ад Віцебска, 13 *км* ад чыг. ст. Бычыха, каля шашы г. п. Обаль — в. Бычыха. 68 ж., гасп. 22 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, вет. пункт, магазін.

ЗАДА́ТАК, грашовая сума, якая выдаецца адным з дагаворных бакоў у лік плацяжоў, што належаць другому боку, як доказ заключэння дагавору і забеспячэнне яго выканання. Мае месца толькі паміж грамадзянамі або з іх удзелам. Пагадненне пра З. робіцца пісьмова. Калі той, хто даў З., не выканае дагавору, З. астаецца ў таго, хто яго атрымаў. Калі дагавору не выканае той, хто атрымаў З., ён павінен аддаць З. у падвойным памеры. Ад З. трэба адрозніваць *аванс.*

ЗАДВАРА́НЫ, вёска ў Смалянскім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 10 *км* на У ад Пружан, 109 *км* ад Брэста, 13 *км* ад чыг. ст. Арапчыцы. 106 ж., гасп. 40 (1971).

ЗАДВЕ́Я, вёска ў Савіцкім с/с Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл., на р. Змейка. Цэнтр саўгаса «Савіцкі». За 30 *км* на ПнУ ад Баранавіч, 236 *км* ад Брэста, 10 *км* ад чыг. ст. Пагарэльцы. 776 ж., гасп. 227 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, магазін.

ЗАДВО́Р'Е, вёска ў Курылавіцкім с/с Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Шчара. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 30 *км* на У ад Мастоў, 98 *км* ад Гродна, 32 *км* ад чыг. ст. Масты. 152 ж., гасп. 46 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. 3 помнікі на брацкіх магілах 300 адпавяскоўцаў, расстраляных ням.-фаш. захопнікамі ў 1942.

ЗАДЗЕ́Ў'СКАЕ, возера ў бас. р. Мядзелкі, правага прытока Бірветы (бас. Дзісны), у Пастаўскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,95 *км*². Даўж. 2,3 *км*, найб. шыр. 1,2 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. 24 *м*, сярэдняя 5,3 *м*. Катлавіна выцягнута з Пн на Пд. Зах. схіл умерана стромкі, выш. да 10 *м*, астатнія больш нізкія, спадзістыя, пераважна пад ворывам; паўн. і паўн.-заходні ўкрытыя лесам, забалочаныя. Азёрная чаша падзяляецца на паўн., усх. і паўднёвы плёсы. Вадазбор (95,2 *км*²) спадзіста-хвалісты і нізінны. Паўн. і паўднёвая часткі возера моцна зарастаюць трыснягом, чаротам, рдзестам і жоўтым гарлачыкам. Слаба праточнае: упадае р. Спарыца, сцёк па пратоцы ў воз. Думбля. Водзяцца акунь, плотка, лешч, шчупак, лінь, язь, карась.

ЗА́ДНЕВА, вёска ў Азерацкім с/с Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзімітрова. За 10 *км* на ПнУ ад Талачына, 128 *км* ад Віцебска, 13 *км* ад чыг. ст. Талачын, каля шашы Талачын — Орша (2 *км*). 119 ж., гасп. 44 (1971). Клуб, б-ка, магазін. Брацкая магіла 31 сав. воіна і партызана, якія загінулі ў Айч. вайну.

«ЗАДО́НШЧЫНА», помнік рускай літаратуры канца 14 ст., паэтычная аповесць пра Кулікоўскую бітву 1380.

Вядома шэсць спісаў «З.». Напісана разанцам Сафоніем. «З.», ці «Слова Сафонія разанца пра вялікага князя Дзмітрыя Іванавіча і брата яго Уладзіміра Андрэевіча», услаўляе перамогу над татара-манголамі як вынік яднання сіл усяе Русі. Прасякнута пачуццямі патрыятызму. У вобразах, стылі і ідэйным замысле «З.» адчуваецца ўплыў «Слова аб палку Ігаравым».

Публ.: У кн.: Воинские повести древней Руси, М.— Л., 1949. *Л. Л. Каротка*я. Мінск.

ЗАДО́Р'Е, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Дзяржынскага. За 50 *км* на Пн ад Лагойска, 90 *км* ад Мінска, 35 *км* ад чыг. ст. Будслаў, на аўтамаб. дарозе в. Даўгінава — в. Жардзяжка. 357 ж., двароў 103 (1971). Лясніцтва, сепаратарны пункт, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, вет. пункт, адцз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗА́ДРАЧ, возера ў бас. р. Ловаць, у Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,74 *км*². Даўж. 2 *км*, найб. шыр. 0,8 *км*, сярэдняя 0,37 *км*, найб. глыб. 14 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы высокія, часткова парослыя лесам. Паверхня вадазбору (56 *км*²) — спалучэнні марэнных градаў і ўзгоркаў з участкамі водналедавіковых паніжэнняў. Праз З. працякае р. Ловаць. Водзяцца плотка, лешч, шчупак, акунь, джгір.


ЗАДРО́Ў'Е, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл., на р. Адроў. Цэнтр сельсавета і калгаса «Барацьбіт». За 20 *км* на З ад Оршы, 80 *км* ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Коханава, на шашы Мінск — Масква. 229 ж., гасп. 87 (1971). Клуб, б-ка, адцз. сувязі, магазін. У 1941 ням.-фаш. захопнікі спалілі больш за палову вёскі.

ЗАДРУ́ЦЦЕ, гарадзішча, паселішча і курганы могільнік у в. Задруцце Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл., на правым беразе Дняпра. Даследавалі А. М. Ляўданскі, А. Дз. Каваленя, Ю. У. Кухарэнка, Л. Д. Побаль. Гарадзішча было ўмацавана валам і ровам. Пры раскопках знойдзены рэчы і кераміка мілаградскай і зарубінецкай культуры, на паселішчы і ў могільніку кераміка 1-га тысячагоддзя н. э. і эпохі Кіеўскай Русі.

ЗАДУБЕ́ННЕ, вёска ў Пузырскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Пушкіна. За 40 *км* на ПдУ ад Мядзела, 143 *км* ад Мінска, 4 *км* ад чыг. ст. Крывічы. 282 ж., двароў 88 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Пач. школа, клуб, б-ка. Помнік 15 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАДУБРО́Ў'Е, вёска ў Віцебскім р-не; падпарадкоўваецца Суражскаму гарпасялковаму Савету. За 34 *км* на ПнУ ад Віцебска, на шашы Віцебск — г. п. Сураж. 384 ж., гасп. 152 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, швейная майстэрня, сталовая, 2 магазіны. Абеліск на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАДЫЯ́К, поясзадыяка (грэч. zōdiakós ад zōon жывёла), 12 сузор'яў, па якіх робіць свой бачны шлях Сонца на працягу года: Рыбы, Авен, Цялец, Блізняты, Рак, Леў, Дзева, Шалі, Скарпіён, Стралец, Казярог, Вадалій (гл. рыс.).



Вачны гадавы рух Сонца па задыяку і сапраўдны рух Зямлі вакол Сонца.

Большасць гэтых сузор'яў мае назву жывёл, таму ў глыбокай старажытнасці іх сукупнасць назвалі «задыякам» («круг жывёл»), а сузор'і — задыякальнымі. Кожнае з іх абазначаецца пэўным знакам (гл. *Знакі астранамічныя*). У задыякальным сузор'і Сонца знаходзіцца прыблізна месяц. Вясною, напр., яно паслядоўна праходзіць па сузор'ях Рыб, Авена і Цяльца, і тады гэтыя сузор'і нам не відаць ноччу, бо знаходзяцца разам з Сонцам пад гарызонтам. Затое процілеглыя сузор'і Дзевы, Шалю і Скарпіёна відны ўсю ноч. Летам назіраюцца ўжо іншыя задыякальныя і суседнія з імі сузор'і і г. д. Па сезонных зменах выгляду зорнага неба стараж. народы вызначалі пачатак пэўнай пары года. Рух Сонца па З.— з'ява ўяўная, гэта прамое адлюстраванне сапраўднага і процілегла накіраванага руху Зямлі вакол Сонца.

ЗАДЫЯКА́ЛЬНАЕ СВЯТЛО́, слабае рассеянае свячэнне, выцягнутае ўздоўж эклітыкі (г. зн. у поясе *задыяка*). Мае форму нахіленага светлавога конуса, найбольш яркага і шырокага паблізу Сонца. У сярэдніх шыротах найлепш назіраецца ў студз.— сак. на заходнім схіле неба неўзабаве пасля захаду Сонца, а ў кастр.— снежні — на ўсходзе

перад узыходам Сонца. З. с. тлумачыцца рассеяннем сонечнага святла мноствам часцінак міжпланетнага асяроддзя, якія рухаюцца вакол Сонца прыблізна ў плоскасці эклітыкі.

Літ.: Дивари Н. Б. Зодиакальный свет, «Успехи физических наук», 1964, т. 84, в. 1 (бібліягр.).

ЗАЖО́Р, гл. ў арт. *Рэкі*.

ЗАЖЫ́НКІ, народнае свята пачатку жніва. Перад З. прыбіралі хату і двор. Жняя выходзіла на ніву з хлебам-соллю, сырам, віталася з полем, клапялася зямлі. Нажаўшы першы сноп жыта, прыгаворвалі: «Стаўлю сноп на сто коп, на тысячу мерак», прыбіралі кветкамі, стужкамі, з песнямі неслі дахаты і ставілі на покуце; зерне з яго пазней дамешвалі да насеннага жыта. Зажынкавыя песні ўваходзяць у цыкл *жніўных песень*. З. часам спраўляюць і ў сучаснай вёсцы.

ЗАЖЭ́ВІЧЫ, вёска ў Салігорскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Перадавік». За 8 *км* на У ад Салігорска, 141 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе г. п. Старобін — в. Пагост. 1525 ж., гасп. 430 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, адцз. сувязі, магазін.

ЗАЗЕ́Р'Е, вёска ў Пярэжырскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., на р. Свіслач. Цэнтр эксперым. базы «Зазер'е» Беларускага НДІ земляробства. За 44 *км* на ПнЗ ад Мар'інай Горкі, 32 *км* ад Мінска, 4 *км* ад чыг. ст. Седча. 684 ж., гасп. 204 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, адцз. сувязі, сталовая, магазін. Помнік ураджэнцу вёскі Герою Сав. Саюза А. П. *Луцэвічу*. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЗЕ́РКА, вёска ў Пярэжырскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., каля р. Свіслач (2 *км*). Цэнтр калгаса «Барацьба». За 43 *км* на ПнЗ ад Мар'інай Горкі, 30 *км* ад Мінска, 2 *км* ад чыг. ст. Седча. 528 ж., двароў 184 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. 3 студз. 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, закатавалі 27 мірных жыхароў. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЗЁРСКАЯ, кармавы сорт бульбы, выведзены ў Бел. НДІ земляробства клонавым адборам з сорту Фрунудэль.

Ураджайны, сярэднеспелы, ракаўстойлівы. Клубні круглаватыя, жоўтыя, важаць 95—147 *г*. Скурка гладкая, вочкі глыбокія, мякаць светла-жоўтая. Крухмалістасць 10,7—16,3%. Улежнасць добрая. Раянаваны ў БССР. Іл. гл. на ўклейцы да арт. *Бульба*.

Літ.: Гл. пры арт. *Бульба*.

ЗАЗУЛЯ Максім Мітрафанавіч (1905, в. Урасбаш Казанскага пав.— 29.9.1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Вызначыўся ў Брагінскім р-не Палескай вобл. 29.9.1943 адзін з першых фарсіраваў Дняпро, замяніў камандзіра ўзвода, які выбыў са строю. Узвод на чале з З. выбіў ворага з траншэі. Асабіста захапіў 3 кулямёты. Загінуў у баі.

ЗАЗЯМЛЕ́ННЕ, прыстасаванне для электрычнага злучэння з зямлёю эл. машын, апаратаў, прылад, правадоў і інш. У энергетычных, прамысл. і камунальных эл. установах З. прызначана забяспечваць работу абсталявання ў нармальным рэжыме (рабочае З.) і аварыйных умовах, засцерагаць людзей ад эл. току (ахоўнае З.). Заземляюцца нейтралі трансфарматараў, нулявыя правады нізкавольтавых (да 500 *в*) сетак, ахоўныя тросы ліній электраперадач, разрадзнікі, карпусы эл. машын (гл. рыс.) і апаратаў, метал. канструкцыі і інш. У праводнай сувязі З. выкарыстоўваецца для засцярогі ліній, прылад і апаратаў, а таксама людзей ад перанапружанняў і маланкі (ахоўнае З., гл. *Ахова ліній сувязі*); паляпшае работу (шляхам засцярогі ад вонкавых перашкод) прыёмна-перадавальнай апаратуры (экраннае З.). Эл. супраціўленне кожнага тыпу З. (асабліва ахоўнага) строга рэгламентуецца і падлягае перыяд. праверцы.




Схема заземлення электрычных рухавікоў: *1* — заземляльнік; *2* — трансфарматар; *3* — правады нізкавольтавай лініі; *4* — засцерагальнікі; *5* — рухавікі; *6* — праваднік заземлення рухавіка; $I_к$ — ток кароткага замыкання; КЗ — месца замыкання на корпус.

З. складаецца з электрода (заземляльніка), які мае непасрэдны кантакт з зямлёю, і правадніка, што злучае электрод з аб'ектам. У энергетыцы і сувязі на электроды ідуць стальныя трубы, стрыжні, лісты, рэйкі і інш. Яны забіваюцца ці закопваюцца на глыбіню ўзроўню грунтавых водаў (на 2—3 *м*) і злучаюцца стальнымі палосамі з дапамогаю зваркі. Пры вял. супраціўленні З. грунт вакол электродаў насычаецца растворамі солей або робяцца глыбінныя (5 *м* і больш) заземляльнікі. Для З. выкарыстоўваюцца таксама стальныя падземныя канструкцыі, трубаправоды (акрамя газавых і цэнтр. ацяплення) і інш.

Літ.: Атабеков В. Б. Заземляющие устройства электрических сетей и подстанций, М., 1967; Правила устройства электроустановок, 4 изд., М.— Л., 1966; Якобс А. И., Коструба С. И. и Сутин А. Г. Эксплуатация заземлений сельских электроустановок, М., 1969; Крикун И. В. Испытания заземляющих устройств, М., 1967.

ЗАЙКА́ННЕ, функцыянальнае парушэнне мовы. Гл. *Неўрозы*.

ЗА́ЙКАВА, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., каля воз. Сясіта. Цэнтр сельсавета. За 49 *км* на ПнУ ад Гарадка, 80 *км* ад Віцебска, на шашы, якая злучае Гарадок з шашой Невель — Веліж (РСФСР). 140 ж., гасп. 61 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, адцз. сувязі, магазін. Ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 102 мірных жыхароў, якім у З. пастаўлены помнік.

ЗАЙКО́Ў'СКІ Станіслаў Станіслававіч [н. 23.7(4.8).1899, в. Жаўткі Беластоцкага пав.], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1936). У Чырв. Арміі з люстага 1918. У грамадз. вайну ўдзельнік баёў на Зах. фронце супраць польскіх інтэрвентаў, разгрому краштацкага мяцяжу і тамбольскага контррэвалюц. паўстання. У Айч. вайну на Паўд.-Зах. і 3-м Укр. франтах. З сак.

1944 у Войску Польскім: нач. штаба, камандзір дывізіі. У 1945—55 нач. аддзела ваен. акругі, нач. пяхотнага вучылішча. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі, 3 ордэнамі ПНР. Жыве ў Адэсе.

ЗАЙМЕ́ННІК (лац. pronomen, ад pro замест+nomen імя), часціна мовы, якая паказвае на прадметы і якасці, не называючы іх. Канкрэтнае значэнне мае толькі ў звязнай мове, дзе выступае як марфал. сінонім да назоўніка, прыметніка і лічэбніка.

Паводле суадносін з інш. часцінамі мовы З. падзяляюцца на назоўнікавыя (пры ўтварэнні і скланенні маюць розныя асновы: я — мы, ты — вы, я — мяне, ты — цябе, хто — каго), прыметнікавыя і лічэбнікавыя (скланяюцца пераважна як прыметнікі); паводле значэння — на асабовыя (я, мы, ты, вы, ён, яна, яно, яны), зваротны (сябе), прыналежныя (мой, наш, твой, ваш, свой), пытальна-адносныя (хто, што, які, каторы, чый), указальныя (гэты, той, такі, гэтакі), азначальныя (сам, самы, увесь, усякі, іншы, кожны), адмоўныя (ніхто, нішто, нічый, ніякі), няпэўныя (нехта, нешта, некаторы, нейкі, нечы, хтосьці, штосьці, якісьці, хто-небудзь, што-небудзь, які-небудзь і інш.). У сказе выконваюць ролю *дзейніка, выказніка* і даданых членаў, пераважна *дапаўнення* і *азначэння*.

Літ.: Граматыка беларускай мовы, т. 1 — Марфалогія, Мн., 1962. *Я. М. Камароўскі.* Мінск.

ЗАЙЦАВА КАПУ́СТА, агульная назва некат. раслін з мясістым лісцем. Найчасцей З. к. называюць расліны з роду *расходнік* сям. таўсцянкавых.

ЗАЙЦАВА РЭ́АКЦЫЯ, метад атрымання трацічных (другасных) спіртоў дзеяннем цынкарганічных галагенідаў на кетоны (эфіры мурашынай к-ты). Прапанаваны А. М. *Зайцавым.*

Спачатку цынкарганічнае злучэнне далучаецца да карбанільнай групы кетону ці мурашынага эфіру і ўтвараюцца алкагаляты, гідроліз апошніх вядзе да ўтварэння спіртоў. З. р.— развіццё прапанаванага А. М. Бутлеравым спосабу атрымання трацічных спіртоў з хлорангідрыдаў карбонавых к-т і цынкалкілаў. Атрыманыя паводле З. р. спірты доўгі час наз. «спіртамі Зайцава», яны адыгралі важную ролю ў развіцці тэорыі будовы арган. злучэнняў Бутлерава. *М. А. Маер.* Мінск.

ЗАЙЦАЎ Аляксандр Міхайлавіч [20.6(2.7).1841, Казань — 19.8(1.9).1910], рускі хімік-арганік. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1885), праф. Казанскага ун-та (1870). Скончыў Казанскі ун-т (1862). Адкрыў (1875) заканамернасці адшчаплення элементаў галагенавадародных к-т ад галагенавытворных (правіла З.). Распрацаваў метады атрымання спіртоў з дапамогаю галагенцынкарганічных злучэнняў (гл. *Зайцава рэакцыя*). Атрымаў і вывучыў вял. колькасць многаатамных спіртоў, спіртавокісаў, оксікіслот; адкрыў (1873) новы клас арган. злучэнняў — лактоны. Стварыў вялікую школу хімікаў.

Літ.: Александр Михайлович Зайцев. 1841—1910, у кн.: Люди русской науки, под ред. И. В. Кузнецова, М., 1961, с. 489 (бібліягр.).

ЗАЙЦАЎ Васіль Георгіевіч (1915, Стаўрапаль — 1956), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). На фронце з 1941, камандзір эскадрыллі. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 21.12.1943 у складаных метэаралаг. умовах знішчыў некалькі варожых складаў, пераправу на Зах. Дзвіне, зрабіў 386 баявых вылетаў; знішчыў 3 танкі, 60 гармат, 200 аўтамашын, 20 складаў, 60 вагонаў.

ЗАЙЦАЎ Георгій Міхайлавіч [23.4(5.5).1895, г. Орша — 13.1.1961], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. (1943). З служачых. Чл. КПСС з 1937. Скончыў Ваен. акадэмію Ген. штаба (1941). У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з каст. 1918. У сак. 1919 — вер. 1921 ваяваў на Зах. фронце і на Тамбоўшчыне супраць бандаў Антонава. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга (1921). У Айч. вайну на Зах., Данскім, Сталінградскім, Варонежскім і Паўд.-Зах. франтах: нач. аддзела і камандзір злучэння. У 1947—55 нач. кафедры. З 1955 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 5 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнам ЧССР.

ЗАЙЦАЎ Іван Пятровіч (1.3.1922, в. Новы Аляксандраўка Зубцоўскага пав. Цвярской губ.— 11.3.1963), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1942. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15.10.1943 група кулямётчыкаў на чале з З. фарсіравала Дняпро каля Лоева, захапіла варожую траншэю, замацавалася на плацдарме, адбіла некалькі контратак.



ЗАЙЦАЎ Іван Сцяпанавіч (9.10.1926, пасёлак Чонкі Гомельскага пав. — 16.4.1945), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. Удзельнік Айч. вайны з снеж. 1943 — на 3-м Укр. і 1-м Бел. франтах. Вызначыўся ў баі за авалоданне чыг. ст. Вербіг (Германія). Па ўласнай ініцыятыве папоўз да дзота, агонь якога стрымліваў наступленне сав. воінаў. З заклікам «За Радзіму!» кінуўся на дзот і сваім целам закрыў амбразуру. Пахаваны ў Костшыне (Польшча).

ЗАЙЦАЎ Мікалай Якаўлевіч (н. 10.3.1923, Крупкі Мінскай губ.), Герой Сав. Саюза (1945). З рабочых. Чл. КПСС з 1944. Скончыў школу пілотаў у Арэнбурзе, БДУ імя Леніна (1967). У Чырв. Арміі з 1941. У Айч. вайну на 1-м і 4-м Укр. франтах — лётчык-штурмавік, камандзір звяна. Удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі. Зрабіў 185 баявых вылетаў, правёў 15 паветр. баёў, збіў 2 самалёты, знішчыў 20 танкаў, 80 аўтамашын, 43 гарматы і мінамёты, 20 чыг. вагонаў. Жыве ў Мінску.



ЗАЙЦАЎ Сцяпан Харытонавіч (н. 10.5.1918, в. Савосціна Ельнінскага пав. Смаленскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1938. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. ў чэрв. 1944. На чале стралковага батальёна ўдзельнічаў у вызваленні

Сіроціна, фарсіраваў Зах. Дзвіну і Ушачу. Жыве ў Маскве.

ЗАЙЦАЎ Фёдар Іванавіч [н. 20.1(2.2).1913, в. Курына Віцебскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1942. У 1937—40 старшыня калгаса, дырэктар цагельнага з-да ў Суражскім р-не Віцебскай вобл. Удзельнік вызвалення Зах. Беларусі (1939). У партызанах са студз. 1942: камандзір аддз., узвода, палітрук роты, камісар узвода; з ліст. 1943 камісар *партызанскай брыгады імя ВЛКСМ* Віцебскай вобл. З 1944 на сав. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі. Жыве ў Гродне.

ЗАЙЦАЎ Якаў Паўлавіч [н. 6(19).1.1918, с. Нікольскае Паўлаўскага пав. Варонежскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1947. На фронце з 1942. Вызначыўся 22—24.2.1944 у Гомельскай вобл. На чале ўзвода процітанкавых ружжаў фарсіраваў Дняпро і першы ўварваўся ў Рагачоў. Жыве ў Сочы.

ЗАЙЦАЎ Яўген Аляксеевіч [н. 21.12.1907 (3.1.1908), г. Невель Віцебскай губ.], беларускі савецкі жывапісец. Нар. маст. БССР (1964). Чл. КПСС з 1939. Вучыўся ў Віцебскім маст. тэхнікуме (1926—30) і ў АМ у Ленінградзе (1930—37) у К. Пятрова-Водкіна і А. Асмёркіна. Працуе ў галіне станковага і манументальнага жывапісу. Першыя работы («Чапаеў», 1937; «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск у 1920 годзе», 1940) паказалі схільнасць мастака да гераіка-эпічных тэм, поўных драм. дзеяння. У Айч. вайну быў на фронце (1941—43), з 1943 працаваў у Маскве ў штабе партыз. руху, удзельнічаў у афармленні сатыр. перыяд. выданняў «Партызанская дубінка» і «Раздавім фашысцкую гадзіну». Экспанаваў на юбілейнай выстаўцы, прысвечанай 25-годдзю БССР (1944, Масква), «Пахаванне Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава» (1942, эскіз да карціны), «Юны партызан», «Партрэт нар. арт. БССР А. В. Нікалаевай», «Палявыя кветкі» (усе 1943). Вярнуўшыся ў Мінск у 1944, стварыў шэраг работ для Бел. дзярж. музея гісторыі Вял. Айч. вайны: «Разбураная ЦЭЦ у Магілёве», «Руіны горада Магілёва», «Будаўніцтва моста на Дняпры каля Магілёва» (усе 1944), «Мінск гарыць» (1945) і інш. Творам З. характэрныя высокае пачуццё грамадзянскасці, эмацыянальна-вобразнае вырашэнне тэмы; мастак імкнецца раскрыць гераіку часу і народа цераз унутр. стан герояў, паказаных у канкрэтных гістар. умовах. Яго карцінам уласцівыя манументальнасць кампазіцыі, эмацыянальная выразнасць каларыту, пастознасць мазка. Сярод твораў пасляваеннага часу: карціны — «Пахаванне героя» (1946), «Парад партызанаў у Мінску ў 1944 го-



Я. А. Зайцаў. Сталь пасмерць. 1948. Брэсцкі абласны краязнаўчы музей.

дзе», «Збожжа першага абмалоту — дзяржаве» (абедзве 1947), «Сталь пасмерць» (1948), «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе» (1950), «Прыезд У. І. Леніна ў Петраград у 1917 годзе» (1946—51), «Канстанцін Заслонаў» (1957), трыпціх «Мая рэспубліка ў агні Айчыннай» (1963—67), «Рэквіем» («Клятва Ільічу», 1970); пейзажы і натюрморты — «Над Свіслаччу», «Півоні» (абодва 1945), «Лясная дарога», «Дубкі» (абодва 1953), «Вечар на рацэ Проні», «Кіеў», «Бераг Дняпра» (усе 1954), «Прыпяць», «На Палессі» (абодва 1955), «Бэз» (1960), «Бераг ракі Віліі» (1962); партрэты — Герояў Сац. Працы А. І. Стыкут, У. І. Пайграй (абодва 1948), І. С. Маліноўскага (1963), паэтаў М. Танка (1948), П. Броўкі, П. Глебкі (абодва 1968), свінаркі А. І. Чарняўскай, брыгадзіра Кандраценкі (абодва 1954) і інш. Стварыў манументальныя роспісы ў Бел. т-ры оперы і балета — «Севільскі цырульнік» і «Кармэн» (1940, не збераглісь), «Яўген Анегін» (1958) і ў кінатэатры «Піянер» (1965, з І. Ціханавым) у Мінску. Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі. У Дзярж. маст. музеі БССР 49 работ мастака. Іл. гл. таксама на ўкл. да гэтага арт. і да арт. *Батальны жанр.*

Літ.: Герасимович П. Евгений Алексеевич Зайцев, М., 1958; Изобразительное искусство Белорусской ССР, М., 1957; Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960; Маслені-каў П. В. Беларускі савецкі тэматычны жывапіс, Мн., 1962. *С. І. Кітаніна.* Мінск.

ЗАЙЦЫ (Lagomorpha), атрад млекакормячых. Аб'ядноўвае 2 сям.: зайцовых і пішчухавых (гл. *Пішчухі*). Пашыраны ва ўсім све-



1. Заяц-русак. 2. Заяц-бялюк.

це, акрамя паўд. часткі Паўд. Амерыкі, в-ва Мадагаскар, Новай Зеландыі і Антарктыды. У СССР 14 відаў, у т. л. 5 відаў роду зайцоў. На Беларусі 2 віды: З.-бяляк (Lepus timidus) і З.-русак (L. europaeus).

Прадстаўнікі атр. З. маюць 2 пары разцоў у верхняй сківіцы, кароткі хвост, доўгія вушы, дужыя і доўгія заднія ногі. З.-бяляк (маса 3,1—4,2 кг) летам мае рыжавата-шэрае футра, зімою белае. Пашыраны на Пн БССР. Жыве ў лясных нізінах, балоцістых зарасніках. Корміцца летам травяністымі раслінамі, зімою — карою і галінкамі дрэў. 2—4 прыплоды на год. Нараджае 3—4 зайчанят. З.-русак (маса 4—5 кг) летам мае вохрыста-бурую поўсць з рыжымі плямамі, зімою — святлейшую. Корміцца і размнажаецца, як і З.-бяляк. Пашыраны па усёй Беларусі. Жыве на адкрытых мясцінах (палях, сухіх лугах, у рэдкіх лясах). З.— аб'ект промыслу (выкарыстоўваюцца мяса і шкурка). Шкодзяць (асабліва З.-русак) садам і пасевам.

Літ.: Фауна СССР, т. 3, в. 10, М.— Л., 1964; Колосов А. М., Лавров Н. П. и Наумов С. П. Биология промысловых зверей СССР, М., 1965; Наумов С. П. Экология зайца-беляка, М., 1947; Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961. *В. Е. Гайдук.* Брэст.


ЗАКАЗНІК дзяржаўны, частка тэрыторыі, якая спецыяльна ахоўваецца, каб павялічыць колькасць каштоўных прамысловых звяроў, птушак, рыб або зберагчы рэдкія жывёлы і расліны, унікальныя прыродныя ўтварэнні. У адрозненне ад запаведнікаў у З. поўнае або частковае гасп. выкарыстанне аб'ектаў, што ахоўваюцца, забараняецца пераважна на пэўны тэрмін.

З. бываюць паляўнічыя, рыбныя, геал., гідралагічныя, ландшафтныя і інш. У залежнасці ад важнасці аб'ектаў прыроды, якія ахоўваюцца, ёсць З. рэспубліканскага значэння (ствараюцца паводле пастановы Савета Міністраў рэспублікі) і З. мясцовага значэння (ствараюцца паводле рашэння выканкомаў абл. Саветаў дэпутатаў працоўных). Дзяржсправы паляўнічыя З. рэсп. значэння ствараюцца тэрмінам да 10 гадоў, мясц. значэння — да 5 гадоў. Усе іншыя дзяржсправы З. ствараюцца на пяцігадовы тэрмін. На тэр. БССР да 1980 дзейнічаюць 5 дзяржсправы паляўнічых З. рэсп. значэння: Казьянскі (пл. 43 тыс. га, Шумілінскі і Полацкі р-ны Віцебскай вобл.), Лепінскі (88 тыс. га, Салігорскі р-н Мінскай, Жыткавіцкі р-н Гомельскай, Лунінецкі р-н Брэсцкай абл.), Налібоцкі (83 тыс. га, Стаўбцоўскі і Валожынскі р-ны Мінскай вобл., Іўеўскі р-н Гродзенскай вобл.), Чэрыкаўскі (69 тыс. га, Чэрыкаўскі, Краснапольскі і Слаўгарадскі р-ны Магілёўскай вобл.), Чачэрскі (82 тыс. га, Чачэрскі і Веткаўскі р-ны Гомельскай вобл.). У 1969 абгрунтаваны дзяржсправы гідралагічнымі З. рэсп. значэння і балотныя масівы: Дзікае (7,4 тыс. га, Пружанскі р-н Брэсцкай і Свіслацкі р-н Гродзенскай абл.), Ельнашчанскае (43 тыс. га, Ляхавіцкі і Іванаўскі р-ны Брэсцкай вобл.), Заазер'е (3,6 тыс. га, Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл.). У гэтых З. забаронена здабыча торфу і інш. работы, звязаныя са зменай гідралагічнага рэжыму тэрыторыі. У 1970 абгрунтаваны дзяржсправы ландшафтным З. рэсп. значэння унікальны прыродны комплекс воз. Свіцязь з навакольскімі лясамі на 847 га, дзе забаронены высечка лесу (акрамя санітарнай), адстрэл дзікіх жывёл і інш. парушэнні прыроднага комплексу і працэсаў, якія ў ім адбываюцца. Усе дзяржсправы З. пад наглядам адпаведных дзяржсправы органаў; агульны кантроль за іх дзейнасцю ажыццяўляе Дзяржсправы камітэт Савета Міністраў БССР па ахове прыроды.

Літ.: Примечательные природные ландшафты СССР и их охрана, М., 1967; Долбик М. С. Заповедники и заказники Белоруссии, у кн.: Охрана природы, Мн., 1969. *А. У. Абатурын.* Мінск.

ЗАКАЛЬНОЕ, вёска ў Рачэнскім с/с Любанскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Будаўнік». За 19 км на ПдЗ ад Любані, 171 км ад Мінска, 44 км ад чыг. ст. Урэчча, каля аўтамаб. дарогі г. Любань — г. п. Старобін (1 км). 649 ж., двароў 179 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАКАМАРА (у архітэктуры), паўкруглае завяршэнне сцяны царкоўнага будынка,



якое звычайна адпавядае форме ўнутранага скляпення. Уласцівае пераважна стараж.-рус. храмам. Побач з З., што мелі канструктыўны характар, у рус. архітэктуры 16—17 ст. былі пашыраны дэкар. З., т. зв. *какошнікі*.

ЗАКАПАНЭ (Zakopane), курорт у ПНР, за 110 км ад Кракава, каля Высокіх Татраў (840—1000 м над узр. м.), у далінах р. Белы Дунаец. Клімат горны з параўнальна цёплаю зімой (сярэдняя т-ра студз. —5 °С) і негарачым летам (сярэдняя т-ра жн. 15 °С). Лечаць хворых на розныя формы туберкульозу лёгкіх і інш. органаў. Сезон увесь год.

Літ.: Борисов А. Д. Важнейшие курорты социалистических стран Европы, М., 1967.

ЗАКАПЫЦЦЕ, чыг. ст. на лініі Гомель — Унеча (РСФСР), пасёлак у Кармянскім с/с Добрушскага р-на Гомельскай вобл. За 12 км на У ад Добруша, 37 км ад Гомеля. 198 ж., двароў 65 (1971). Магазін.

ЗАКАРПАЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ, на З Украінскай ССР. Утворана 22.1.1946. Пл. 12,8 тыс. км². Нас. 1057 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 13 раёнаў; 9 гарадоў, 14 гар. пас. Цэнтр г. Ужгарад.

З. в. размешчана на паўд.-вах. схілах Усх. Карпат і на паўн.-усх. ускраіне Сярэднедунайскай нізіны. Горы займаюць ⅘ тэр. Хрыбты (Вулканічны, Паланіна і інш.) выцягнуты з ПнЗ на ПдУ. На У асобныя горныя масівы з альпійскімі формамі





рэльефу і найвыш. пункт З. в.— г. Гаверла, 2061 м. Карысныя выкапні: кам. соль, буд. матэрыялы, буры вугаль, жал. руда, ртутная руда, мармур, вапнякі, андэзіт і інш. Мінер. крыніцы. Клімат умераны кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. на раўнінах —1,7, у гарах —5; —7 °С; ліп. адпаведна 19,2; 13; 9 °С. Ападкаў на ПдЗ 600—700 мм, на ПнУ 1200—1600 мм за год. Рэкі Ціса (з прытокамі Цярэбля, Рыка і інш.), Латарыца, Уж належаць бас. Дуная. Глебы на нізіне алювіяльныя, буразёмна-падзолістыя, дзярнова-глеевыя; у гарах бурыя лясныя, горныя падзолістыя і горныя лугавыя. 51,6% тэр. занята лесам. На выш. ад 200 да 800 м букавыя і мяшаныя лясы, ад 800 да 1600 м хвойныя, вышэй за 1600 м альпійскія лугі — паланіны, якія выкарыстоўваюцца як паша. Асн. насельніцтва ўкраінцы, жывуць рускія, венгры і інш. Сярэдняя шчыльн. 82,6 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 30% (1970). Гарады: Ужгарад, Мукачава, Берагава, Вінаградаў, Хуст, Чоп і інш.

Найб. развіты харчовая, лясная, дрэваапр., мэблевая, горназдабыўная прамысловасць. Прадпрыемствы агародніна-кансервавай, вінаробнай, лясной, малочнай, мукамольнай, кандытарскай прамысловасці ў Ужгарадзе, Мукачаве, Вінаградаве, Берагаве, Цячаве і інш. Мэблевая, дрэваапр. прамысловасць у Ужгарадзе, Мукачаве, Берагаве, Сваляве, Цярэсве, Буштыне. Лесахімія дае вацтную к-ту, фармалін, метылавы спірт і інш. Прадпрыемствы ў Сваляве, Перачыне, Вял. Бычкове. У Рахаве кардонная ф-ка. З прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці найбольшыя ф-ка галаўных убораў у Хусце, абутковыя, швейныя, трыкатажныя ф-кі ў Ужгарадзе, Мукачаве, Берагаве, Вінаградаве. Станкабуд. з-д і з-д зборнага жалезабетону (Мукачава), прыладабудаўнічыя (Мукачава і Ужгарад), цагляна-чарапічныя з-ды. Энергетычная база — Ужгарадская ЦЭС, Цярэбле-Рыкская ГЭС і ЦЭЦ у Рахаве. Па тэр. З. в. праходзіць нафтаправод «Дружба», газаправод «Брацтва» і высакавольтавая лінія «Мір». У с. гасп. найбольш развіты малочна-мясная жывёлагадоўля, вырошчванне збожжавых, садоўніцтва і вінаградарства. На пач. 1971 у З. в. 143 калгасы і 21 саўгас. Пасяўная пл. с.-г. культур у 1970 (тыс. га) 181,8, з іх пад збожжавымі 65,0, тэхн. 5,9, агародніна-бахчавымі і бульбай 38,2, кармавымі 72,7. Асн. збожжавыя культуры (тыс. га): пшаніца 38,1, кукуруза 9,6, авёс 4,9; з тэхн.— тытунь 3,8, сланечнік 1,8. На пач. 1971 (тыс. галоў) буйн. раг. жывёлы 308,3 (у т. л. кароў 151,2), свіней 239, авечак і коз 298,8, птушак 1551,1. Даўж. чыгунак 641 км (1970). Гал. чыг. лініі: Чоп — Мукачава — Львоў, Чоп — Ужгарад — Львоў, Чоп — Рахаў — Івана-Франкоўск. Аўтамаб. дарог 3200 км, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 3000 км. Уп-т, 14 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Тэатр. З музеі. Абл. газ. «Закарпатська правда» на ўкр. і рус. мовах, «Kárpati igaz szó» («Закарпацкая праўда» на венгерскай мове).

Курорты. З. в.— кліматычная і бальнеалагічная курортная мясцовасць. Лекавыя фактары: горны клімат, больш як 300 мінер. крыніц з вуглякіслымі, серавадароднымі і інш. водамі. Для ваннаў і пітнога лячэння выкарыстоўваецца вуглякіслая гідракарбанатна-натрыевая вада «Паляна-Купель» і гідракарбанатна-натрыевая «Свалява»; для ваннаў сульфатна-кальцыева-магніевая вада. Разліваюць на пітное лячэнне вуглякіслую гідракарбанатна-натрыевую ваду з крыніц «Паляна-Квасава», «Лужанская», «Свалява». У 1970 было 7 санаторыяў, пансіянат, 2 дамы адпачынку. Лечаць хваробы органаў стрававання, апоры і руху, печані, жоўцевых шляхоў, перыферычнай нерв. сістэмы. Сезон увесь год.

Літ.: Советское Закарпатье. Справочник-путеводитель, 4 изд., Ужгород, 1968; Здравницы профсоюзов СССР, 3 изд., М., 1967; Курорты СССР, М., 1962.

ЗАКАРПАЦКАЯ УКРАІНА (Закарпацце), гістар. назва сучаснай тэр. *Закарпацкай вобласці* УССР.

У 10—11 ст. у складзе Кіеўскай Русі, з канца 11 ст. пад уладай Венгрыі, з пач. 18 ст.— Аўстрыі (з 1867 Аўстра-Венгрыі). У 1919 адышла да бурж. Чэхаславакіі. У кастр. 1944 Сав. Армія вызваліла З. У. ад нямецка-фаш. захопнікаў. 26.11.1944 1-ы з'езд Народных к-таў ухваліў рашэнне пра ўз'яднанне З. У. з Сав. Украінай. 29.6.1945 паводле дагавору паміж СССР і Чэхаславакіяй увайшла ў склад УССР.

ЗАКАРЫЯДЗЕ Сяргей Аляксандравіч [18.6 (1.7).1909, Баку — 13.4.1971], грузінскі савецкі акцёр тэатра і кіно. Нар. арт. СССР (1958). Вучань К. Марджанішвілі. З 1926 працаваў у т-рах Тбілісі і Кутаісі. Ролі: Давід («Давід Будаўнік» Л. Готуа), Багратіён («Багратіён» Самсоніі), Эдып («Цар Эдып» Сафокла) і інш. З 1934 здымаецца ў кіно: Шадыман Бараташвілі («Георгій Саакадзе»), паштальён Георгій («Дзень апошні, дзень першы»), Георгій

Махарашвілі («Бацька салдата», Ленінская прэмія СССР 1966). Дэп. Вярх. Савета СССР 7-га і 8-га скл. Дзярж. прэміі СССР 1946, 1952. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі.

ЗАКАЎКАЗЗЕ, частка Каўказа, якая знаходзіцца на Пд ад Галоўнага Каўказскага хрыбта. На тэрыторыі З. размешчаны Азербайджанская ССР, Армянская ССР і Грузінская ССР.

ЗАКІРАЎ Ахмет Закіравіч [н. 6(19).3.1911, в. Кашкалеева Бірскага пав. Уфімскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1953. У Чырв. Арміі з 1933. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. 27.9.1943 на чале групы байцоў пераправіўся цераз Дняпро, зніштчыў кулямётную кропку ворага, выбіў яго з траншэй, што дало магчымасць батальёну пераправіцца і замацавацца на плацдарме. Жыве ў Уфе.

ЗАКЛАДНІЦТВА, пераход дзярж. цяглых людзей да феадалаў у Рускай дзяржаве 13 — пачатку 18 ст.

Каб пазбавіцца цяжкіх дзярж. падаткаў і павіннасцей, збяднелыя сяляне і гараджане дамаўляліся («закладваліся») з феадаламі перайсці да іх, калі будуць зменшаны павіннасці. Пры гэтым закладнікі трацілі асабістую свабоду і траплялі ў залежнасць да феадала. Упершыню З. ўпамінаецца ў дагаворнай грамаце 1266 Ноўгарада з цвярскім князем. Дакументы 15—16 ст. сведчаць пра існаванне З. на Полацкай зямлі. Урад, не задаволены памяншэннем даходаў ад скарачэння *цяглых сялян*, Судзебнікам 1550 забараніў гандлёвым людзям «закладвацца» за манастыры, а ў 1584 — свецкім феадалам прымаць закладнікаў. Пастановы 1619, 1638 абавязалі закладнікаў вярнуцца на старыя месцы. З. фармальна забаронена Саборным улажэннем 1649, аднак існавала да пач. 18 ст.

Літ.: Павлов-Сильванский Н. П. Феодализм в удельной Руси, СПб., 1910; Греков Б. Д. Крестьяне на Руси с древнейших времен до XVII века, т. 1, 2 изд., М., 1952. *А. П. П'янкоў.* Мінск.

«ЗАКЛІК», штомесячны літаратурна-мастацкі часопіс арганізацыйнага камітэта Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР, які выходзіў у Мінску са студз. да крас. 1933. Друкаваў літ. творы, нарысы пра ўдарнікаў сацыялістычнага спаборніцтва, матэрыялы па мова- і літаратуразнаўстве, успаміны старых бальшавікоў, хроніку літ. жыцця Беларусі і саюзных рэспублік. У часопісе выступалі З. Бядуля, Ц. Гартны, П. Глебка, К. Крапіва, М. Лужанін, М. Лынькоў, М. Чарот, К. Чорны, пісьменнікі саюзных рэспублік. Выйшла 4 нумары. Рэдактар А. Александровіч.

ЗАКОВАНКА, рака, левы прыток Прыпяці (бас. Дняпра). Даўж. 42 *км*. Цячэ ў Калінкавіцкім і Мазырскім р-нах Гомельскай вобл. Каналізавана. Вадазбор (306 *км*²) на У Палескай нізіны. Рэльеф слаба парэзаны, в асобнымі невысокімі градамі, выцягнутымі паралельна даліне ракі. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1,2 *м*³/*сек*.

ЗАКОЗЕЛЬ, вёска ў Драгічынскім р-не Брэсцкай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Закозельскі». За 14 *км* на ПдЗ ад Драгічына, 100 *км* ад Брэста, 9 *км* ад чыг. ст. Драгічын. 453 ж., гасп. 133 (1971). Спірт. з-д. Клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, сталовая, магазін.

ЗАКО́Н, неабходная і істотная сувязь з'яў у прыродзе і грамадстве, якая абумоўлівае іх развіццё і ўзаемадзеянне. Паняцце З. бліжэй да паняцця сутнасці (гл. *З'ява і сутнасць*). Ідэалісты адмаўляюць аб'ектыўны характар З., абвяшчаюць іх прадуктам свядомасці чалавека (Кант, махісты і інш.) або нейкай абсалютнай ідэі (Гегель). Філасофскі матэрыялізм прызнае аб'ектыўны характар З. прыроды і грамадства. З. навукі таксама не ствараюцца людзьмі адвольна, а адлюстроўваюць З. аб'ектыўнага свету ў іх свядомасці. Існуюць З. прыватныя, якія ахопліваюць абмежаваную вузкае кола з'яў, строга пэўныя формы руху матэрыі; агульныя, дастасоўныя да шэрагу формаў руху матэрыі; усеагульныя — З. матэрыяліст. дыялектыкі, уласцівыя ўсім без выключэння аб'ектам рэчаіснасці. Адкрыццё З.— складаны працэс паступовага набліжэння думкі ад пазнання вонкавых, неістотных сувязей прадметаў да пазнання іх сутнасці. З., пазнаныя людзьмі, служаць асновай іх мэтанакіраванай дзейнасці па пераўтварэнні свету.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952; Энгельс Ф. Дыялектыка прыроды, Мн., 1954; Ягоў. Анты-Дзюрынг, Мн., 1952; Ленін У. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм, Тв., т. 14 (Полн. собр. соч., т. 18); Ягоў. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 29 (там жа, т. 29); Ковалгин В. М. Диалектический материализм о законах науки, Мн., 1958; Голованов В. Н. Законы в системе научного знания, М., 1970. *І. П. Мамыкін.* Мінск.

ЗАКО́Н (у праве), нарматыўны акт найвышэйшага органа дзярж. улады, прыняты ў адпаведнасці з вызначанага канстытуцыяй парадку. У З. выяўляюцца дзярж. воля правячага класа, яго палітыка і эканам. інтарэсы. Маюць найвышэйшую юрыд. сілу ў дастасаванні да актаў, якія прымаюць інш. дзярж. органы. Ні выяўляецца ў тым, што ніякі дзярж. орган, апрача заканадаўчага, не можа адмяніць ці змяніць З., а таксама ў тым, што ўсе акты (рашэнні, пастановы і інш.) органаў дзярж. кіравання, грамадскіх арг-цый павінны ім адпавядаць. Па характары прававых нормаў З. бываюць канстытуцыйныя і звычайныя.

Канстытуцыйныя З. вызначаюць асн. прынцыпы грамадскага і дзярж. ладу, выбарчую сістэму, асн. правы і абавязкі грамадзян, парадак утварэння дзярж. органаў. Паводле Канстытуцыі СССР агульнасаюзным З. прымае Вярх. Савет СССР. У саюзных і аўт. рэспубліках З. прымаюць адпаведныя Вярх. Саветы. З. СССР маюць аднолькавую юрыд. сілу на тэрыторыі ўсіх рэспублік. Калі З. саюзнай ці аўт. рэспублікі разыходзіцца з агульнасаюзным, то дзейнічае агульнасаюзны. Заканадаўчы працэс складаецца з некалькіх стадый: заканадаўчая ініцыятыва, разгляд і абмеркаванне законапраекта, прыняцце З. З., якія прымаюцца Вярх. Саветам СССР, падпісваюцца Старшынёй і сакратаром Прэзідыума Вярх. Савета СССР і публікуюцца ў спец. выданні «Ведамасці Вярхоўнага Савета Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік» на мовах рэспублік. Тэкст З. таксама публікуюць у газетах, часопісах, перадаюць па радыё. Паводле арт. 20 і 21 Канстытуцыі БССР Вярх. Савет БССР — вышэйшы орган дзярж. улады і адзіны заканадаўчы орган БССР. Законы, прынятыя Вярх. Саветам БССР, падпісваюцца Старшынёй і сакратаром Прэзідыума Вярх. Савета БССР, публікуюцца на рус. і бел. мовах у спец. выданні «Збор законаў, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Беларускай ССР». Усе З., якія прымаюцца ў СССР, усебакова абмяркоўваюцца ў заканадаўчым органе, ва

камісіях і ўсёй грамадскасцю. Не раней як праз 7 дзён пасля прыняцця З. публікуецца, а праз 10 дзён пасля апублікавання (калі тэрмін не агаворан ў самім З.) набывае сілу.

Звычайныя З.— нарматыўныя акты Вярх. Савета СССР і Вярх. Саветаў саюзных і аўт. рэспублік, якія прымаюцца на аснове Канстытуцыі. Нарматыўныя акты органаў дзярж. улады і дзярж. кіравання (указы Прэзідыума Вярх. Савета СССР, саюзных і аўт. рэспублік, пастановы і распараджэнні Савета Міністраў СССР, саюзных і аўт. рэспублік, рашэнні мясцовых Саветаў) — падзаконныя акты. Яны грунтуюцца на З. У капіталіст. дзяржавах З. замацоўваюць уладу эксплуататараў. З., якія прымаюцца парламентам, афіцыйна прызнаюцца найвышэйшымі, а на справе ўсё большае значэнне набываюць акты ўрада ці інш. асоб, якія ўзначальваюць бурж. краіны. У гэтым выяўляецца тэндэнцыя, уласцівая імперыялізму,— павышэнне ролі выканаўчай улады ў дастасаванні да заканадаўчай.

Літ.: Калинычев Ф. И. Советское законодательство в период строительства коммунизма, М., 1966; Ковачев Д. А. Законодательный процесс в европейских социалистических государствах, М., 1966; Пиголкин А. С. Подготовка проектов нормативных актов (организация и методика), М., 1968. *А. А. Прымачонак.* Мінск.

ЗАКО́Н АБ АБАРО́НЕ МІ́РУ, закон аб крымінальнай адказнасці за прапаганду вайны. У СССР прыняты Вярх. Саветам СССР 12.3.1951. У адпаведнасці з заклікам Другога Сусв. кангрэсу прыхільнікаў міру (1950), а таксама кіруючыся высокімі прынцыпамі савецкай міралюбівай палітыкі, Вярх. Савет СССР пастанавіў, што прапаганда вайны, у якой бы форме яна ні вялася, падрывае справу міру, стварае пагрозу новай вайны і з'яўляецца найцяжэйшым злачынствам супраць чалавецтва. Паводле З. аб а. м. асобы, вінаватыя ў прапагандзе вайны, падлягаюць адказнасці як цяжкія крымін. злачынцы. У арт. 68 КК БССР за прапаганду вайны прадугледжана пазбаўленне волі на 3—8 гадоў. З. аб а. м. прыняты ў Венгрыі, Румыніі, Балгарыі, Чэхаславакіі, Польшчы, ГДР, МНР, Албаніі.

Публ.: Сборник законов СССР и указов Президиума Верховного Совета СССР, т. 1, М., 1968.

ЗАКО́НЫ І ЗВЫ́ЧАІ ВАЙНЫ́, сукупнасць прававых нормаў міжнар. права, якія рэгулююць узаемаадносіны бакоў, што ваююць, а таксама вызначаюць становішча нейтральных дзяржаў у час вайны або ўзброенага канфлікту. Мэта: ліквідаваць найб. жорсткія спосабы вядзення ваен. аперацый і забяспечыць абарону цывільнага насельніцтва. Дзейныя З. і з. в. вызначаны міжнар. пагадненнямі ці склаліся традыцыйна. З. і з. в. вызначаюць прававое становішча ўзбр. сіл (гл. *Камбатанты*), тэатра ваен. дзеянняў, ваенпалонных, ахвяр вайны і цывільнага насельніцтва, нейтральных дзяржаў, спосабы і сродкі вядзення вайны; забараняюць рабаванне і зніштчэнне культ. каштоўнасцей і гістар. помнікаў; рэгулююць пытанні парламентарыяў, капітуляцыі, акупацыі і перамір'я. Найбольш важныя міжнар. пагадненні, у якіх зафіксаваны З. і з. в.: *Гаагскія канвенцыі* (1899 і 1907), Жэнеўскі пратакол 1925, *Жэнеўскія канвенцыі* 1949, Гаагская канвенцыя 1954. Міжнар. права забараняе агрэс. войны, лічыць *агрэсію* цяжкім злачынствам супраць міру і бяспекі чалавецтва. Выкарыстанне ўзбр. сіл дапускаецца толькі пры самаабароне ці ў выпадку выканання абавязкаў па калектыўнай абароне ад агрэсіі. Парушэнне З. і з. в.— міжнар. злачынства. Дзяржава, якая зрабіла яго, павінна кампенсаваць прычыненыя страты. Асобы, вінаватыя ў парушэнні З. і з. в., прызнаюцца *ваеннымі злачынцамі*. Практыка дзвюх сусв. войнаў, укаранёныя інтэрвенцыі ЗША ў Карэі, Паўд.-Усх. Азіі, агрэсія Ізраіля на Б. Усходзе сведчаць пра тое, што імперыяліст. дзяржавы звычайна парушаюць З. і з. в. СССР з інш. сацыяліст. краінамі выконвае агульнапрызнаныя міжнар. З. і з. в., паслядоўна выступае за заключэнне міжнар. пагадненняў, якія садзейнічаюць ліквідацыі варварскіх метадаў і сродкаў вядзення вайны (пра ўсеагульнае і поўнае раззбраенне, забарону ядзернай, хім. і біял. зброі). Гл. таксама *Абвяшчэнне вайны, Акупацыйны рэжым.*

Кр.: Женевские конвенции о защите жертв войны..., М., 1969.

Літ.: Трайнин А. Н. Избр. произв. Защита мира и уголовный закон, М., 1969; Законы и обычаи войны, М., 1942. *А. Е. Гурыновіч.* Мінск.

ЗАКО́Т, старадаўні спосаб пабудовы тарцовых сцен сялянскай хаты на Беларусі, у Паволжы, у карэлаў, фінаў, нарвежцаў, датчан.

Бярвенне сцяны на ўзроўні франтона паступова ўкарочвалася, набываючы выгляд ступеньчатага трыкутніка. На выступы клалі падстрэшныя жардзіны-латы, якія служылі асновай страхі. Спосаб З. пашыраны і ў гасп. пабудовах.

ЗАКРУТАЧНАЯ МАШЫ́НА, машына, якая герметычна закрывае бляшанкі, слоікі.

Асн. частка машыны — ролікі, якія пры абкочванні бляшанкі або слоіка дэфармуюць накрыўку і ўтвараюць падвойнае шво ў бляшанцы ці шчыльнае злучэнне са слоікам. У прамысловасці пашыраны аўтам. З. м., якія закручваюць бляшанкі і слоікі пад вакуумам. Велічыня вакууму рэгулюецца і можа дасягаць ад 33 да 53 кн/м² (250—400 *мм рт. сл.*). Бываюць адна- і шматпазіцыйныя. Прадукцыйнасць З. м. для шкляной тары 200 слоікаў за мінуту. Найб. ужываюцца ў харч. прамысловасці.

Літ.: Дикис М. Я. и Мальский А. Н. Технологическое оборудование консервных заводов, М., 1969.

ЗАКУКЛІВАННЕ ЗЛА́КАЎ, вірусная хвароба, якая выклікаецца вірусам сібірскай мазаікі аўса (Avena virus-1). На яе хварэюць пераважна авёс, радзей кукуруза, ячмень, проса, жыта і некат. дзікарослыя злакі. Узбуджальнік пераносіцца цёмнай цыкадкай Liburnia striatella.



Закукліванне аўса.

Вірус зімуе ў карэнішчах пырніку, каласоўніку і ў целе лічынак цёмнай цыкадкі; у восені і ў глебе не захоўваецца. Прыкметы хваробы: жоўтыя падоўжныя плямы на лісці, празмерная кусцістасць раслін (развіваецца да 70—80 сцяблоў), карлікавасць, бясплоддзе. Найб. пашкоджваюцца ўраджаныя пасевы. Меры барацьбы: зніштчэнне цёмнай цыкадкі, сяўба ў аптымальныя тэрміны, унясенне фосфарных і калійных угнаенняў, глыбокае ўзблеванае ворыва з папярэднім лушчэннем, захаванне севазваротаў.

Літ.: Горленко М. В. Сельскохозяйственная фитопатология, М., 1968.

ЗАКУПЫ, катэгорыя феад.-залежнага насельніцтва ў Кіеўскай Русі 11—12 ст. і ў Вял. кн. Літоўскім 14—16 ст.

Для вядзення ўласнай гаспадаркі З. браліў феадала павіну («куп»), за што абавязваліся абрабляць яго зямлю. У адрозненне ад *халопаў* мелі права на адыход у заработкі, скардзіцца на гаспадара ў суд, забаранялася іх забіваць. Вярнуўшы павіну, З. станавіўся свабодны, пры спробе ўцячы не разлічыўшыся — ператвараўся ў халопа. Закупніцтва — адна з формаў ператварэння збяднелых *смердаў* у феад.-залежных сялян. У Вял. кн. Літ. 14—16 ст. З.— даўжнік феадала. Да выплаты павіны адрабляў пашчыну ў яго гаспадарцы. Калі З. не вяртаў павіну за 10 гадоў, ператвараўся ў прыгоннага.

Літ.: Черепнин Л. В. Из истории формирования класса феодально-зависимого крестьянства на Руси, «Исторические записки», 1956, т. 56; Похилевич Д. Л. Изменение правового положения крестьян Великого княжества Литовского в XVI в., «Уч. зап. Львовского государственного ун-та. Сер. историческая», 1953, т. 25, в. 5.

ЗАКУРДАЕЎ Васіль Іванавіч [н. 25.12.1902 (7.1.1903), Пецярбург], сав. партыйны дзеяч. З служачых. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Ін-т нар. гасп. імя Пляханава (1926), вучыўся ў Ін-це чырв. прафесуры ў Маскве (1932). У 1919—40 на гасп., сав. і парт. рабоце. З сак. 1940 заг. арганіз. аддзела Пінскага абкома, з ліст. нам. заг., потым заг. аргінструктарскага аддзела ЦК КП(б)Б, з чэрв. 1946 першы сакратар Баранавіцкага абкома, з лют. 1949 да ліп. 1950 сакратар ЦК КП(б)Б. З 1951 першы сакратар Мардоўскага абкома КПСС. У 1959—61 нам. старшыні, потым старшыня Камісіі сав. кантролю пры Савеце Міністраў РСФСР. На XX з'ездзе КПСС выбіраўся канд. у чл. ЦК; на XIX з'ездзе КП(б)Б — чл. ЦК. Чл. Бюро ЦК КП(б)Б з 19.2.1949 да 3.6.1950. Дэп. Вярх. Савета СССР 2—4-га скл., Вярх. Савета БССР 2-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Маскве.

ЗАКУЦЦЕ, вёска ў Каўбчанскім с/с Клічаўскага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Ольса (0,2 *км*). Цэнтр калгаса «Іскра камуны». За 15 *км* на Пн ад Клічава, 85 *км* ад Магілёва, 6 *км* ад чыгуначнага раз'езда Сталлава, на аўтамабільнай дарозе Бераэіно — Клічаў. 293 ж., двароў 106 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

ЗАКУШНЯК Аляксандр Якаўлевіч (11.3.1879, Адэса — 21.4.1930), рускі савецкі артыст эстрады. Заснавальнік сав. рэаліст. школы маст. чытання. У 1906 пачаў творчую дзейнасць як драм. акцёр. У 1910—14 і з 1924 выступаў як чытальнік («Вечары інтымнага чытання», «Вечары апавяданняў»). Выконваў літ. кампазіцыі па творах А. Пушкіна, М. Гогаля, Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага, А. Франса, апавяданнях А. Чэхава, У. Караленкі, І. Бабеля і інш.

Тв.: Вечера рассказа. Воспоминания. Тексты, М.— Л., 1940.

ЗАЛАТАМІНО, вёска ў Кармянскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр Хляўнянскага с/с і саўгаса «Рудзянскі». За 19 *км* на ПнУ ад Кармы, 129 *км* ад Гомеля, 79 *км* ад чыг. ст. Рагачоў. 496 ж., гасп. 143 (1971). Млын, лесапільня, камбінат быт. абслугоўвання, аўтатрактарная майстэрня. Пач. школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, бальніца, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЛАТАРОВА Марыя Міхайлаўна [н. 4(17).9.1907, Вазнясенск Херсонскай губ.], беларуская савецкая вучоны ў галіне афтальмалогіі. Д-р мед. н. (1951), праф. (1952). У 1930 скончыла Адэскі мед. ін-т. Працавала ў вочных клініках мед. ін-таў у Данецку (1934—41), Ашхабадзе (1941—51). Заг. кафедры вочных хвароб Віцебскага мед. ін-та (1951—54) і Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў (з 1954). Асн. працы па лячэнні эпідэмічнага кан'юнктывіту ў Туркменіі, вызначэнні афтальмалагічных прыкмет пры розных хваробах арганізма. Аўтар падручнікаў па вочных хваробах для ўрачоў, мед. сёстраў, фельчараў. Падручнік для фельчараў выдадзены на англ. і арабскай мовах.

Тв.: Глазные болезни, 2 изд., Мн., 1964; (разам з М. Г. Рабіновічам) Офтальмологические симптомы при различных заболеваниях организма, Мн., 1965; Офтальмологические симптомы при болезнях органов и полости рта, Мн., 1969.

ЗАЛАТАРОЎ Аляксей Антонавіч [н. 25.3(7.4).1917, с. Ніжні Какуй Нерчынска-Заводскай акругі Забайкальскай вобл.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1941. У Чырв. Арміі з 1939. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. У ноч на 28.9.1943 пераправіўся цераз Дняпро і паладзіў сувязь. Пад артыл. агнём праціўніка ліквідаваў 45 пашкоджанняў тэлеф. лініі. Жыве ў Кіеве.

ЗАЛАТАРОЎ Васіль Андрэевіч [24.2(7.3).1872, Таганрог — 25.5.1964], рускі і беларускі савецкі кампазітар і педагог. Засл. арт. РСФСР (1932), нар. арт. БССР (1949). Праф. (1918). Выхаванец Прыдворнай пеўчай капэлы (вучань М. Балакірава і А. Лядава), скончыў Пецярбургскую кансерваторыю (1900, клас М. Рымскага-Корсакава). Выкладаў у Маскоўскай (1909—18) і Кубанскай (1920—24) кансерваторыях, Адэскім (1924—26) і Кіеўскім (1926—30) муз.-драм. ін-тах, Свярдлоўскім муз. тэхнікуме (1930—33). У 1933—41 вёў клас кампазіцыі ў Бел. кансерваторыі, садзейнічаў росту нац. кампазітарскіх кадраў. Сярод вучняў: Л. Абелёвіч, У. Алоўнікаў, А. Багатыроў, М. Крапівер, Дз. Лукас, П. Падкавыраў. Творча развіваў рэаліст. традыцыі рус. класічнай музыкі ў дастасаванні да актуальнай сучаснай тэматыкі. Напісаў шэраг твораў на матэрыяле ўкр., узб., тадж., туркм., малд. фальклору. У бел. муз. культуру арганічна ўвайшлі яго балет «Князь-возера» (паст. 1940, Дзярж. прэмія СССР 1950; на тую ж музыку паст. балеты «Аповесць пра каханне», 1953, і «Палымяныя сэрцы», 1955), заснаваны на вобразах бел. легендаў, сімфонія «Беларусь» (4-я, 1934), Танц. сюіта (1937) і увертюра-фантазія на



бел. тэмы (1937) для сімф. аркестра, Маленькая сюіта на тэмы зах.-бел. песень для хору a cappella (1943), цыкл апрацовак нар. песень для голасу з сімф. аркестрам «Кантрасты» (1933). З інш. тв.: 3 оперы, у т. л. «Дзекабрысты» (паст. 1925); 4 кантаты; 7 сімфоній, у т. л. «Чалюскінцы» (3-я, 1934), «Мая Радзіма» (6-я, 1944); 6 струнных квартэтаў; рамансы; хоры; апрацоўкі нар. песень. Аўтар кнігі «Фуга» (1932) — першай рус. працы, спецыяльна прысвечанай гэтай муз. форме. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Літ. тв.: Воспоминания..., М., 1957; Фуга, 3 изд., М., 1965.

Літ.: Нисневич С., В. А. Золотарев, М., 1964. *С. Г. Нісневіч.* Мінск.

ЗАЛАТАРОЎ Іван Фёдаравіч (н. 1922, в. Ваўчаты Мамадышскага пав. Казанскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1941. Вызначыўся 10.10.1943 у Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. Пад агнём праціўніка арганізаваў пераправу батальёна цераз Дняпро, першы з групай байцоў уварваўся ў варожыя траншэі. Жыве ў Чыце.

ЗАЛАТАЯ АРДА (Улус Джучы), феад. дзяржава на тэр. Сярэдняй Азіі і Усх. Еўропы ў 13—15 ст. Створана ў 40-я г. 13 ст. ханам *Батыем* [1236—1255], сынам хана Джучы (адсюль і другая назва), у выніку захопніцкіх паходаў мангола-татар.

Да 1262 падпарадкоўвалася Мангольскай імперыі. Цэнтр З. А.— землі Ніжняга Паволжа, сталіца пры Батыі — Сарай-Бату (каля Астрахані), з 1-й пал. 14 ст.— Сарай-Берке (каля Валгаграда). Уладанні З. А. ад Карпат на З да р. Іртыш на У, ад Чорнага, Каспійскага і Аральскага м. і воз. Балхаш на Пд да Ноўгарадскай зямлі на Пн. У вас-



сальнай залежнасці ад З. А. была і большасць рус. зямель (гл. *Мангола-татарская няволя*). З. А. была штучным дзярж. аб'яднаннем з эканамічна адасобленымі раёнамі. Этнічны склад яе насельніцтва неаднародны: вандроўныя цюркскія плямёны — полаўцы (кіпчакі), башкіры, канглы, татары і аселае земляробчае насельніцтва — харэзмійцы, грэкі, рускія, волжскія балгары, мардва і інш. Сярод насельніцтва З. А. манголаў было мала, і ў працэсе асіміляцыі (13—14 ст.) яны ўспрынялі цюркскія мовы. Узровень сац. і культ. развіцця насельніцтва З. А. таксама неаднародны: у вандроўнікаў панавалі патрыярхальна-феад. адносіны, у земляробчых раёнах — развіты феадалізм. На захопленых землях даніну збіралі *баскакі*. Феад. міжусобіцы і дварцовыя перавароты спрыялі паліт. адасабленню ўскраін. Спробы ханаў Узбека (1312—42) і Джанібека (1342—57) ламаць супраціўленне феадалаў, умацаваць вярх. уладу не далі станоўчых вынікаў. Пасля забойства хана Джанібека за 23 гады (1357—80) на троне З. А. змянілася 25 ханаў. Барацьба заняволеных народаў за незалежнасць паскорыла распад З. А. На Русі ўмацнілася Маск. княства, якое пачало паспяховую барацьбу з З. А. У 60-я г. 14 ст. вярнуў сабе незалежнасць Харэзм; вял. літоўскі кн. Альгерд адабраў у З. А. ўкр. землі. У *Кулікоўскай бітве* 1380 З. А. пацярпела паражэнне ад Маск. княства. У 1389—96 войскі Цімура разбурылі гарады З. А., у 20-я г. 15 ст. ад З. А. адасобілася Сібірскае ханства, у 40-я г. Нагайская Арда, у 1438 — Казанскае, у 1443 Крымскае, у 60-я г. Казахскае, Узбекскае, Астраханскае ханствы. У 1480 хан Ахмат зрабіў апошні паход на Русь. Аднак татара-манголы дайшлі да р. Угры і мусілі адступіць. Русь канчаткова вызвалілася ад мангола-татарскай няволі. Уладанні апошніх ханаў З. А. называліся «Вялікая Арда», якая перастала існаваць у 1502, калі ле тэр. была падзелена паміж Крымскім і Астраханскім ханствамі.

Літ.: Насонов А. Н. Монголы и Русь, М.— Л., 1940; Греков Б. Д. и Якубовский А. Ю. Золотая Орда и ее падение, М.— Л., 1950.

А. П. П'янкоў. Мінск.


ЗАЛАТАЯ ЛОШЫЦКАЯ, беларускі селекцыйны сорт чарэшні, выведзены ў Бел. НДІ садоўніцтва, агародніцтва і бульбы (1937) з сеянцаў ад вольнага апылення сорту *Дзенісена жоўтая*. Пашырана ў цэнтр. і паўд. садовых зонах БССР. Плады важаць 2,5—3,5 *г*, круглавата - сэрцападобныя, крэмавыя з светла-ружовым адценнем, сакаўныя, салодкія, паспяваюць у 1-й пал. ліпеня. Пладаносіць на 3-м годзе, сярэдні ўраджай пладоў з 8-гадовага дрэва 25 *кг*, максімальны 46 *кг*. Зімастойкая, устойлівая да грыбных хвароб. Апыляльнікі: Дзенісена жоўтая, Сялягурачка і Паўночная. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Чарэшня*.

ЗАЛАТАЯ РЫБКА, зменена чалавекам форма залатога карася (Garassius auratus). Пашырана ва ўсім свеце. Жыве ў акварыумах да 10—12 гадоў.

У Кітаі З. р. пачалі разводзіць больш за 1000 гадоў таму назад, у Расію завезена ў 18 ст. У выніку гібрыдызацыі, селекцыі і ўтрымання ў розных умовах выведзена больш за 15 формаў (вуалехвост, камета, тэлескоп і інш.). Колер аранжава-чырвоны, залацісты, ружаваты, серабрыста-малочны, чорны, плямісты, мазаічны. Кормяць іх матылямі, дафніямі, кашаю, дажджавымі чарвякамі, мясам, булкай. Іл. гл. на ўкл. да арт. Рыбы.

Літ.: Ильин М. Н. Аквариумное рыбоводство, М., 1968.

ЗАЛАТНІК (у тэхніцы), клапан, размешчаны на шляху патоку вадкасці, газу, пары.



Паваротны залатнік: *1* — утулка; *2* — пласцінка.

Ужываецца для таго, каб вменьваць праходнае сячэнне канала і гэтым самым велічыню патоку. Адрозніваюць З. простыя, цыліндрычныя і паваротныя (гл. рыс.). Выкарыстоўваюцца для кіравання струменем вадкасці (газу, пары) у цеплавых, гідраўл., пнеўмат. машынах і ў сістэмах аўтам. рэгулявання. На Беларусі З. вырабляе Гомельскі завод «Гідрапрывод» і інш. заводы.

ЗАЛАТНІК, адзінка масы ў Ст. Русі і ў Вял. кн. Літ. Быў роўны $^1/_{96}$ (першапачаткова $^1/_{72}$) частцы *фунта*. У сістэме мер Ст. Русі З.=4,266 *г*, Вялікага княства Літоўскага — каля 3,9 *г*.


«ЗАЛАТОГА ВЁКУ» ТЭОРЫЯ, канцэпцыя, якая выкарыстоўвалася бурж.-нацыяналіст. фальсіфікатарамі гісторыі Беларусі для сцвярджэння, быццам бы ў складзе Вял. кн. Літ. (14—16 ст.) бел. народ дасягнуў найвышэйшага за ўсю сваю гісторыю матэрыяльнага дабрабыту, а ўздым тагачаснай беларускай культуры быў абумоўлены вызначальным уплывам заходнееўрапейскай цывілізацыі.

У сапраўднасці нар. масы Беларусі ў 14—16 ст. цярпелі жорсткі феад. прыгнёт, пра што гавораць дакументы і сведчанні сучаснікаў (С. Будны, З. Герберштэйн, Руджыеры, П. Скарга і інш.). Уздым бел. культуры 14—16 ст., які ўсебакова асветлены ў працах сав. гісторыкаў, філосафаў, літаратуразнаўцаў, абумоўлены не вызначальным уплывам зах.-еўрап. цывілізацыі, а перш-наперш багатай спадчынай стараж.-рус. культуры і працэсам фарміравання бел. народнасці. Разам з тым сав. гістарыяграфія не адмаўляе і пэўнага, але не вызначальнага ўплыву на самабытную культуру бел. народа зах.-еўрап. культуры. «З. в.» т. прапагандуецца ідэолагамі антынамунізму. Ілжыва ідэалізуючы далёкае мінулае бел. народа, яны імкнуцца проціпаставіць яго сучаснасці, каб абгрунтаваць выдатныя дасягненні Сав. Беларусі, яе грамадскі і дзярж. лад.

Літ.: Абэцэдарскі Л. У святле неабвержных фактаў, Мн., 1969. *Л. С. Абэцэдарскі.* Мінск.

ЗАЛАТО́Е РУНО́, у старажытнагрэчаскай міфалогіі залатая воўна барана, якую здабылі ў Калхідзе *арганаўты*. У пераносным сэнсе багацце, якім імкнуцца авалодаць. У Бургундыі, Аўстрыі, Іспаніі існаваў найвышэйшы знак узнагароды — ордэн З. р.

ЗАЛАТО́Е СЯЧЭ́ННЕ (гарманічнае дзяленне), дзяленне адрэзка, пры якім большая яго частка ёсць сярэдняя прапарцыянальная паміж усім адрэзкам і меншай яго часткай. Прынцыпы З. с. выкарыстоўваюцца ў архітэктуры. У мастацтве З. с. рэдка ўжываецца ў яго абсалютнай, нязменнай форме; тут вялікае значэнне маюць характар і мера адхіленняў ад абстрактнай матэматычнай прапарцыянальнасці.



З. с. вызначаецца прапорцыяй $a : x = x : (a - x)$; рашэнне атрыманага ўраўн. $x^2 + ax - a^2 = 0$ дае часткі З. с. адпаведна прыбл. 62% і 38% ад усяго адрэзка. Калі ўмову З. с. перапісаць так: $\frac{x}{a}\left(1+\frac{x}{a}\right) = 1$ або $x = \frac{a}{1+\frac{x}{a}}$, то $x = a\,\frac{1}{1+\frac{1}{1+\frac{1}{1+\ldots}}}$, г. зн. x атрымліваецца ў выглядзе *неперарыўнага дробу*. З. с. адрэзка a можна знайсці і геам. спосабам (гл. рыс.).

ЗАЛАТУ́ХА (старая назва скрафулёз), пашкоджанне скуры і лімфатычных залоз ад туберкулёзнай інфекцыі ў арганізме дзяцей пры *дыятэзе*.

ЗАЛАТЫ ЗАПА́С, рэзервовы фонд золата ў злітках і ў манеце, які належыць дзярж. казначэйству або цэнтральнаму банку.

Пры монаметалізме З. з.— рэзервовы фонд для міжнар. плацяжоў, унутранага метал. абарачэння, для плацяжоў па ўкладах і для размену банкнотаў. У перыяд агульнага крызісу капіталізму выпрасла роля З. з. як рэзерву для міжнар. плацяжоў і страціліся астатнія функцыі, бо чаканка залатых манет і размен банкнотаў на золата спынілісь. Выкарыстоўваецца таксама для ўмацавання адносінай устойлівасці капіталіст. валют у час інфляцыі, хістання валютных курсаў, расстройвання сістэмы міжнар. разлікаў; для фінансавання агрэс. блокаў і войнаў; для эканам. і паліт. націску на інш. краіны. Размяркоўваецца паміж капіталіст. краінамі нераўнамерна, усё больш канцэнтроўваецца ў гал. капіталіст. дзяржавах (гл. табл.). Залежыць ад стану плацежнага балансу, пагаршэнне якога (асабліва з павелічэннем асігнаванняў на мілітарызацыю) вядзе да ўцечкі З. з.

Цэнтралізаваны залаты запас капіталістычных краін (мільярдаў долараў)

	1937	1948	1969
Усе прамыслова развітыя краіны	24,0	30,8	35,7
У тым ліку:			
ЗША	12,8	24,4	11,9
Вялікабрытанія	4,1	1,6	1,5
Францыя	2,8	0,5	3,6
ФРГ	—	—	4,1
Краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	1,3	2,3	3,5
Усяго . . .	25,3	33,1	39,2

У сацыяліст. краінах З. з.— частка ўсенароднай уласнасці, выкарыстоўваецца як рэзервовы фонд сусв. грошай у гандлі з капіталіст. дзяржавамі, адзін з дадатковых сродкаў забеспячэння ўстойлівасці валюты. У СССР, акрамя таго,— крыніца фінансавання валют і эканомікі краін сацыяліст. сістэмы.

Літ.: Гл. пры арт. *Золата*. *Б. П. Сапешка.* Мінск.

ЗАЛАТЫ СТАНДА́РТ, грашовая сістэма, пры якой золата з'яўляецца ўсеагульным эквівалентам і існуе размен банкнотаў на залатыя манеты (золатаманетны стандарт), ці на залатыя зліткі (залатазліткавы стандарт), ці толькі на іншаземную валюту (золатадэвізны стандарт).

Золатаманетнаму стандарту характэрныя абарачэнне залатых манет і свабодная чаканка іх пры цвёрда вызначанай залатой вартасці грашовай адзінкі; свабодны абмен непаўнацэнных манет, банкнотаў і папяровых грошай на залатыя манеты; свабодны вываз і ўвоз золата. Быў пашыраны ў гал. капіталіст. дзяржавах у 2-й пал. 19 ст. Пры залатазліткавым стандарце цэнтр. банк купляў золата ў злітках і прадаваў яго па цвёрда вызначанай цане за банкноты, але толькі на вял. суму (у Вялікабрытаніі не менш як 1700 ф. ст.). Уведзены ў выглядзе *неперарыўнага дробу*. З. с. адрэзка a можна знайсці і геам. спосабам (гл. рыс.).

ЗАЛАТУ́ХА (старая назва скрафулёз), пашкоджанне скуры і лімфатычных залоз ад туберкулёзнай інфекцыі ў арганізме дзяцей пры *дыятэзе*.

ЗАЛАТЫ ЗАПА́С, рэзервовы фонд золата ў злітках і ў манеце, які належыць дзярж. казначэйству або цэнтральнаму банку.

Пры монаметалізме З. з.— рэзервовы фонд для міжнар. плацяжоў, унутранага метал. абарачэння, для плацяжоў па ўкладах і для размену банкнотаў. У перыяд агульнага крызісу капіталізму выпрасла роля З. з. як рэзерву для міжнар. плацяжоў і страціліся астатнія функцыі, бо чаканка залатых манет і размен банкнотаў на золата спынілісь. Выкарыстоўваецца таксама для ўмацавання адносінай устойлівасці капіталіст. валют у час інфляцыі, хістання валютных курсаў, расстройвання сістэмы міжнар. разлікаў; для фінансавання агрэс. блокаў і войнаў; для эканам. і паліт. націску на інш. краіны. Размяркоўваецца паміж капіталіст. краінамі нераўнамерна, усё больш канцэнтроўваецца ў гал. капіталіст. дзяржавах (гл. табл.). Залежыць ад стану плацежнага балансу, пагаршэнне якога (асабліва з павелічэннем асігнаванняў на мілітарызацыю) вядзе да ўцечкі З. з.

Цэнтралізаваны залаты запас капіталістычных краін (мільярдаў долараў)

	1937	1948	1969
Усе прамыслова развітыя краіны	24,0	30,8	35,7
У тым ліку:			
ЗША	12,8	24,4	11,9
Вялікабрытанія	4,1	1,6	1,5
Францыя	2,8	0,5	3,6
ФРГ	—	—	4,1
Краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця	1,3	2,3	3,5
Усяго . . .	25,3	33,1	39,2

У сацыяліст. краінах З. з.— частка ўсенароднай уласнасці, выкарыстоўваецца як рэзервовы фонд сусв. грошай у гандлі з капіталіст. дзяржавамі, адзін з дадатковых сродкаў забеспячэння ўстойлівасці валюты. У СССР, акрамя таго,— крыніца фінансавання валют і эканомікі краін сацыяліст. сістэмы.

Літ.: Гл. пры арт. *Золата*. *Б. П. Сапешка.* Мінск.

ЗАЛАТЫ СТАНДА́РТ, грашовая сістэма, пры якой золата з'яўляецца ўсеагульным эквівалентам і існуе размен банкнотаў на залатыя манеты (золатаманетны стандарт), ці на залатыя зліткі (залатазліткавы стандарт), ці толькі на іншаземную валюту (золатадэвізны стандарт).

Золатаманетнаму стандарту характэрныя абарачэнне залатых манет і свабодная чаканка іх пры цвёрда вызначанай залатой вартасці грашовай адзінкі; свабодны абмен непаўнацэнных манет, банкнотаў і папяровых грошай на залатыя манеты; свабодны вываз і ўвоз золата. Быў пашыраны ў гал. капіталіст. дзяржавах у 2-й пал. 19 ст. Пры залатазліткавым стандарце цэнтр. банк купляў золата ў злітках і прадаваў яго па цвёрда вызначанай цане за банкноты, але толькі на вял. суму (у Вялікабрытаніі не менш як 1700 ф. ст.). Уведзены

у Вялікабрытаніі ў 1925, потым пашырыўся ў некаторых капіталіст. краінах, якія не ўдзельнічалі ў вайне і назапасілі золата на ваен. пастаўках. Пры золатадэвізным стандарце размен банкнотаў і папяровых грошай ажыццяўляўся толькі на валюту краін з залатазліткавым стандартам. Уведзены ў краінах з недастатковым *залатым запасам* і ставіў валюты гэтых краін у залежнасць ад дзяржаў, валюты якіх выкарыстоўваліся як рэзервовыя. Як і залатазліткавы стандарт, узнік у перыяд часовай і частковай стабілізацыі капіталіст. валют. Усеагульны эканам. крызіс прывёў да краху ўсе тры формы З. с.

Літ.: Фрей Л. И. Валютные и финансовые расчеты капиталистических стран, М., 1969; Ларионов К. А. Кризис капиталистической валютной системы, М., 1969. *З. І. Гіляродзе.* Мінск.

ЗАЛАТЫЯ ПЯСКІ (Златні-Пясыцы), кліматычны прыморскі курорт у Нар. Рэсп. Балгарыі, на ўзбярэжжы Чорнага м., за 17 *км* ад Варны.

Цёплае лета (сярэднія т-ра 22,5 °С), сонечная восень, мяккая зіма. Сонечна 2240 гадзін у год. Купальны сезон ад сярэдзіны чэрв. да канца верасня. Асн. лекавыя фактары: прыморскі клімат, марскія купанні, сонца-, вінаграда-, грязелячэнне. Лечаць хваробы органаў дыхання (нетуберкулёзныя), нырак, сардэчна-сасудзістай, нерв. (функцыянальныя) сістэм, анеміі, парушэнне абмену рэчываў.

Літ.: Борисов А. Д. Важнейшие курорты социалистических стран Европы, М., 1967.

ЗАЛАТЫЯ РУДЫ І РОССЫПІ, горныя пароды, якія змяшчаюць золата ў эканамічна выгаднай для здабычы колькасці. Радовішчы золата падзяляюцца на карэнныя (рудныя) і россыпныя.

Форма залягання рудных целаў карэнных радовішчаў: жылы, лінзы, няправільнай формы целы замяшчэння і інш. Золата ў рудах самароднае, звычайна канцэнтруецца нераўнамерна, у асобных ч. руднага цела (рудных слупах). Паводле паходжання найб. пашыраны гідратэрмальныя радовішчы. Спадарожнікі золата ў рудах пераважна сульфіды (пірыт, халькапірыт, арсенапірыт, бляклыя руды, галеніт, сфалерыт і інш.). Значная ч. золата здабываецца разам з меддзю, нікелем, плацінай з магматычных медна-нікелевых радовішчаў. Каля 15—20% сусв. здабычы золата з залатаносных россыпаў — з прадуктаў разбурэння і пераадкладання матэрыялу рудных радовішчаў. Форма залягання рудных целаў у россыпах: струмені, гнёзды і палосы. У россыпах трапляюцца самародкі золата масаю да некалькіх дзесяткаў кілаграмаў. Асаблівы тып радовішчаў — метамарфізаваныя залатаносныя кангламераты (выкапнёвыя россыпы з уранам). Радовішчы ў СССР (Урал, Казахстан, Сібір, Д. Усход, Закаўказье, Сярэдняя Азія і інш.), Паўд.-Афр. Рэспубліцы (75% запасаў капіталіст. краін), Канадзе, ЗША, Аўстраліі і інш. На Беларусі перспектывы залатаноснасці звязаны пераважна з пародамі, якія складаюць *Беларускі крышталічны масіў*. Гл. таксама *Золата*.

Літ.: Вилибин Ю. А. Основы геологии россыпей, 3 изд., М., 1956; Фосс Г. В. Золото (Типы месторождений, история добычи, сырьевые базы), М., 1963; Соболевский В. И. Благородные металлы. Золото, М., 1970. *У. І. Шкуратаў.* Мінск.

ЗАЛАЦЁЕВА, вёска ў Марачынскім с/с Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Якуба Коласа. За 14 *км* на Пн ад Зэльвы, 100 *км* ад Гродна, 16 *км* ад чыг. ст. Зэльва. 805 ж., гасп. 263 (1971). Пункт быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны. У час бурж. Польшчы ў З. дзейнічалі падпольныя ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ. Помнік 65 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЛАЧЭ́ННЕ, пакрыццё вырабаў, асобных частак прылад і збудаванняў тонкім слоем золата з дэкаратыўнымі і ахоўнымі мэтамі.

Існуе некалькі спосабаў З. Лісцявое — наклейванне на вырабы або паверхні збудаванняў тонкіх (0,1—0,3 *мкм*) лістоў золата; вядома з 3-га тысячагоддзя да н. э. (Егіпет). Ужывалася для аддзелкі палацаў і храмаў. У паліграфіі выкарыстоўваецца для спец. мастацкага друкавання і пісення пераплётаў. Парашковае З.— нанясенне на выраб, укрыты клейкім лакам, тонкага слоя залатога парашку. Агнявое З.— пакрыццё металічных, звычайна медных, лістоў амальгамай (сплаў золата і ртуці) з наступнай адгонкай ртуці нагрэвам. Другі яго спосаб — нанясенне лаку, у якім ёсць золата, на фарфора-фаянсавыя вырабы. Пры абпальванні лак выгарае, а залатое покрыва астаецца. З. плакіроўкай — гарачая пракатка лістоў золата разам з лістамі інш. металу або валачэнне метал. пруткоў, абкручаных лістамі золата. Гэтым спосабам выраблецца *біметал*, які ідзе на карпусы гадзіннікаў і інш. З. *катодным распыленнем* пашырана пры вытворчасці фотаэлементаў, спец. люстраў, грамафонных пласцінак і інш. Гальванічнае З. (гл. *Гальванатэхніка*) робіцца пераважна ў цыляндрычных залатых электралітах.

Літ.: Караванченко В. П. Толстослойное блестящее золочение (покрытие сплавом золото-медь), Л., 1962; гл. таксама пры арт. *Гальванатэхніка*.

ЗАЛВІЦА (залоўка), мужава сястра. Гл. *Родная і свальцтва*.

ЗАЛЕ́ЖСКІ Уладзімір Мікалаевіч (парт. псеўд. Юрый, Уладзімір; 1880, Казанская губ.— 1957), удзельнік рэвалюц. руху ў Расіі і на Беларусі. З служачых. Чл. КПСС з 1902. З 1899 вёў парт. работу ў Астрахані, Царыцыне, Кіеве, Екацярынаславе, Пецярбурзе і інш. У 1910—12 кіраваў экспедыцыяй у Расію з-за мяжы нелегальнай парт. л-ры; знаходзячыся ў Навазыбкаве і Гомелі, займаўся аднаўленнем дзейнасці і быў чл., потым старшынёй Палескага к-та РСДРП. Неадноўчы быў у турмах і ссылках (1902—04, 1913—15, 1916—17). Пасля Лют. рэвалюцыі чл. выканаўчай камісіі Петраградскага к-та РСДРП(б), з крас. 1917 чл. Гельсінгфорскага к-та РСДРП(б). У дні Кастр. ўзбр. паўстання ў Петраградзе ўдзельнічаў у стварэнні Наркамата пошт і тэлеграфаў, потым нам. наркома. У 1918 паліт. камісар Акадэміі Генштаба. У 1919 нач. палітаддзела 1-й Коннай арміі. З 1922 на навук. і пед. рабоце. Узнаг. ордэнам Леніна.

ЗАЛЕ́СКІ Адам Іосіфавіч [н. 22.3(4.4).1912, в. Кімейка Сенненскага пав. Магілёўскай губ.], беларускі савецкі гісторык-этнограф. Д-р гістар. н. (1963), праф. (1964). Чл. КПСС з 1947. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1940). Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1953 заг. сектара этнаграфіі Ін-та гісторыі, з 1957 нам. дырэктара Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, з 1970 навук. супрацоўнік Ін-та гісторыі АН БССР. Вывучае побыт насельніцтва ў партыз. краях і зонах і яго барацьбу супраць ням.-фаш. акупантаў. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

Тв.: (Разам з І. С. Краўчанкам) Белорусский народ в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959; Быт белорусских сёлян у партызанскім краі, Мн., 1960; В партизанских краях и зонах, М., 1962; В тылу врага, Мн., 1969; Героический подвиг миллионов в тылу врага, Мн., 1970.

ЗАЛЕ́СКІ Антон Ігнатавіч (люты 1824, Варшава — 4.10.1885), удзельнік паўстання 1863—64 у Літве і на Беларусі, мастак. З дваран Троскага пав. З канца 40-х г. у сваім маёнтку ў Троскім пав., працаваў як мастак-

графік, ілюстраваў творы А. Міцкевіча і інш. Чл. Віленскай археал. камісіі. У 1862 як прыхільнік «чырвоных» увайшоў у Літоўскі правінцыяльны к-т, дзе разам з К. Каліноўскім рыхтаваў паўстанне. 26.1.1863 арыштаваны і высланы ў Вятку. З 1867 у Варшаве, потым за мяжой.

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

ЗАЛЕ́СКІ (Zaleski) Браніслаў (псеўд. Літвін; 1819 ці 1820, маёнтак Рачкавічы Слуцкага пав. Мінскай губ.— 2.1.1880), польскі і беларускі мастак, пісьменнік і грамадскі дзеяч. Вучыўся ў Дэрпцкім ун-це, удзельнічаў у нелегальных студэнцкіх гуртках. У 1848 сасланы (Хіва і Арэнбург). З Т. Шаўчэнкам удзельнічаў як рысавальшчык у экспедыцыях па Аральскім краі і ў горы Каратау (перапісваўся з Шаўчэнкам у 1853—59, намагаў прадаваць яго карціны і малюнкі на Беларусі). У 1856 вярнуўся ў Рачкавічы (напісаў тут шэраг пейзажаў); жыў у в. Дарава каля Баранавіч, у Мінску, пад Гроднам (1857—59). Удзельнічаў у паўстанні 1863, эміграваў за мяжу. Жыў у Дрэздэне, Рыме (стварыў афорты «Калізей у Рыме», «Від Сан-Мало»). З 1864 (?) жыў у Парыжы, з 1866 сакратар Гістар.-літ. т-ва і рэдактар яго «Штогоднікаў», у 1868 дырэктар Польскай б-кі. Выдаў у Парыжы ілюстраванае (22 афорты) выданне «Жыццё кіргізскіх стэпаў» (1865), «Польскія выгнаннікі ў Арэнбургу» (1866), а таксама ўспаміны пра сучаснікаў;





Б. Залескі. Калізей у Рыме. Афорт. 1864. Серакоўскі ў турме. Малюнак. 1863.

сябраваў з Ц. Норвідам, быў адрасатам яго паэт. ліста «Да Браніслава З.». Аўтар малюнкаў пра паўстанне 1863 («Серакоўскі ў турме» і інш.), пейзажаў («Паток у Ціролі»).

Літ.: Александровіч С. Старонкі братняй дружбы, Мн., 1960, с. 173—181. *Л. Н. Дробай.* Мінск.

ЗАЛЕ́СКІ ПАЛА́Ц, помнік архітэктуры класіцызму. Пабудаваны архітэктарамі М. Шульцам і І. Пусэ для кн. М. К. Агінскага ў Залессі (Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл.) у пач. 19 ст. (паміж 1802 і 1822). Пабудова сядзібнага тыпу. Плану ўласцівыя прастата і рацыянальнасць распрацоўкі, убранню — аскетызм дэкору. Гал. корпус меў у цэнтры



Залескі палац. З малюнка Л. Ходзькі. 1822.

сціплы 4-калонны портык. Корпус, які прылягаў да парку, быў вырашаны больш пластычна, да яго прыбудавана доўгая аранжарэя з каланадай. Вакол палаца разбіты «англійскі» парк з творамі архітэктуры малых формаў (павільёны, мосцікі, вадзяны млын, капліца і інш.). Пад сярэдзіну 19 ст. З. п. ад перабудоў страціў свой пачатковы выгляд. Парк збяднеў лепш.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Калыбанскім с/с Брагінскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр саўгаса «Пасудава». За 50 *км* на Пд ад Брагіна, 215 *км* ад Гомеля, 4 *км* ад чыг. ст. Пасудава. 672 ж., гасп. 231 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік 55 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Глыбоцкім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 22 *км* на Пн ад Глыбокага, 220 *км* ад Віцебска. 311 ж., гасп. 114 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, 2 магазіны. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 11 жыхароў вёскі.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Кобрынскім р-не Брэсцкай вобл., каля Дняпроўска-Бугскага канала (3 *км*). Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Суворава. За 7 *км* на У ад Кобрына, 59 *км* ад Брэста, 10 *км* ад чыг. ст. Кобрын. На шашы Кобрын — Лунінец. 406 ж., двароў 138 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле 6 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Чалюшчавіцкім с/с Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса імя Калініна. За 30 *км* на ПнУ ад ст. Пціч. 540 ж., двароў 79 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання, лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 92 мірных жыхароў.

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Смаргонскім р-не Гродзенскай вобл., на левым беразе Вілii; чыг. ст. на лініі Мінск — Вільнюс. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны партызан». За 12 *км* на ПдУ ад Смаргоні, 272 *км* ад Гродна, каля шашы Мінск — Вільнюс (1 *км*). 806 ж., гасп. 258 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, аптэка, дом састарэлых, аддз.

сувязі, сталовая, 5 магазінаў. Помнік 36 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айчынную вайну. У З. помнік класіцызму *Залескі палац.*

ЗАЛЕ́ССЕ, вёска ў Чачэрскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Сож (1 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Зорка». За 7 *км* на ПдУ ад Чачэрска, 72 *км* ад Гомеля, 42 *км* ад чыг. ст. Буда-Кашалёўская, 2 *км* ад прыстані Крэмень на р. Сож. 895 ж., двароў 240 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, сталовая, магазін. 25.8.1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 39 мірных жыхароў.

ЗАЛІ́Е, вёска ў Урыцкім с/с Гомельскага р-на. Да 1971 цэнтр калгаса імя Калініна. За 17 *км* на З ад Гомеля, каля шашы Гомель — Жлобін (1,5 *км*). 884 ж., гасп. 274 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-акушэрскі і вет. пункты, аддз. сувязі, магазін.

ЗАЛІ́Ў, частка акіяна, мора або возера, якая ўдаецца ў сушу і мае водаабмен з асноўным вадаёмам.

З. бываюць адкрытыя (Гвінейскі, Біскайскі) і закрытыя (Кара-Багаз-Гол). Амаль заўсёды гідралагічны і гідрабіялагічны рэжым З. такі самы, як і асн. вадаёма. Паводле формы і глыбіні З. падзяляюцца на эстуары (глыбокае лейкападобнае вусце ракі), *фіёрды*, *ліманы*, лагуны (неглыбокія З., аддзеленыя ад мора вузкай палоскай сушы). Невялікія З. наз. бухтамі (Новарасійская, Севастопальская). На Пн СССР З. наз. губамі (Мязеньская, Анежская).

ЗАЛІ́ШНЯЯ ПРЫБАВА́ЧНАЯ ВАРТА́СЦЬ, гл. ў арт. *Прыбавачная вартасць.*

ЗА́ЛКА (Zalka) Матэ (23.4.1896, в. Матальч, ПнУ Венгрыі — 11.6.1937), венгерскі пісьменнік. Чл. КПСС з 1920. У 1-ю сусв. вайну трапіў у палон да рускіх (1916). Вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду З. арабіла Кастр. рэв. Удзельнік партыз. руху (1919—20), з 1920 у Чырв. Арміі, камандзір батальёна, потым палка. Удзельнік штурму Перакопа. З 1936 пад імем генерала Лукача камандаваў 12-й Інтэрнац. брыгадай у Іспаніі. Загінуў каля Уэскі. У апавяданнях («Кавалерыйскі рэйд», «Яблыкі» і інш.) услаўляў героіку Кастр. рэв. і грамада. вайны, інтэрнац. салідарнасць працоўных. У рамане «Дабердо» (1937) выкрываў імперыял. характар 1-й сусв. вайны. Узнаг. ордэнам Чырв. Сцяга.



Тв.: Бел. пер.— Аповесць аб вечным міры, Мн., 1931; Бунт. Апавяданне, Мн., 1931; У гасцях у бессмяротных, Мн., 1931; Сяло за туманамі, Мн., 1934; Дабердо, Мн., 1941; рус. пер.— Избранное, М., 1955; Повесть о вечном мире. Повести и рассказы, М., 1966.

Літ.: Матэ Залка — писатель, генерал, человек. Воспоминания. Сб., М., 1968; Россиянов О. К. Матэ Залка. Критико-биогр. очерк, М., 1964; Матэ Залка. Библиогр. указатель, М., 1958.

ЗАЛО́Г, спосаб забеспячэння абавязацельства, які заключаецца ў тым, што даўжнік перадае крэдытору пэўную рэч на выпадак невыканання свайго абавязацельства. Залогатрымальнік мае права ў выпадку невыканання даўжніком забяспечанага залогам абавязацельства атрымаць плату з кошту заложанай маёмасці пераважна перад інш. крэдыторамі, за некат. выключэннямі, якія вызначаны заканадаўствам (арт. 169 ГК БССР). Залогадавальнік (даўжнік або трэцяя асоба) мае права ўласнасці або аператыўнага кіравання маёмасцю, якая закладваецца.

Дагавор пра З. заключаецца пераважна ў забеспячэнне звароту выдадзеных банкам кароткатэрміновых пазык сацыяліст. арг-цыям і пазык грамадзянам на індывідуальнае буд-ва і рамонт жылых дамоў. Прадметам З. можа быць уласная маёмасць, не знятая з грамадзянскага абароту. Пагадненне пра З. робіцца пісьмова.

ЗАЛО́Г ПЯЦІГО́ДКІ, вёска ў Суцінскім с/с Пухавіцкага р-на Мінскай вобл., на беразе канала Суцінка. Цэнтр саўгаса «Залог пяцігодкі». За 34 *км* на Пд ад Мар'інай Горкі, 97 *км* ад Мінска, 13 *км* ад чыг. ст. Талька. 712 ж., гасп. 208 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, 2 магазіны. У Айч. вайну вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАЛО́ЗІСТЫЯ ТКА́НКІ РАСЛІ́Н (залозкі раслін), утварэнні, якія служаць для назапашвання і выдзялення з раслiны кропель вады і розных рэчываў. Да З. т. р. адносяцца гідатоды, нектарнікі, стрававальныя, алейныя, смаляныя, слізевыя і камедзевыя залозкі.

Гідатоды — органы выдзялення кропельна-вадкай вады, размешчаныя на зубчыках і верхавінках лісця многіх раслін. Нектарнікі — органы выдзялення цукрыстай вадкасці (нектару), размешчаныя ў кветках. Стрававальныя залозкі выдзяляюць стрававальныя сокі, здольныя ператвараць арган. рэчывы; ёсць у лісці некат. насякомаедных раслін (расіца, мухалоўка і інш.). Алейныя, смаляныя, слізевыя і камедзевыя залозкі выдзяляюць смолы, эфірны алей, камедзь, слізь, бальзам і інш.

Літ.: Жуковский П. М. Ботаника, 4 изд., М., 1964. *Г. В. Пашына.* Мінск.

ЗАЛО́ЗНІЦА (Scrophularia), род адна-, двух- і шматгадовых травяністых раслін і паўкустоў сям. залозніцавых. Вядома 315 відаў, пашыраных пераважна ў Міжземнамор'і. У СССР 79 відаў; на Беларусі 2.

Сцябло выш. да 1,2 м. Лісце пераважна супрацьлеглае, яйцападобналанцэтнае або шырокаланцэтнае. Кветкі дробныя, неправільныя, зеленавата-бурыя, сабраныя ў радкія мяцёлчатыя суквецці. Плод — каробачка. На Беларусі найб. відомая З. вузлаватая (S. nodosa, нар. назвы: надтыннік, старавіца, воўчая крапіва). Расце ў лясах, хмызняках, на лугах, на берагах рэк. Атрутная для буйн. раг. жывёлы і авечак (змяшчае сапаніны і алкалоід скрафулярын). Меданосная і лекавая расліна.



Залозніца вузлаватая: *1* — верхняя частка расліны; *2* — карэнішча; *3* — кветка.

Літ.: Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

ЗАЛО́ЗЫ ў жывёл і ў чалавека, утварэнні, у саставе якіх клеткі, здольныя сінтэзаваць і выдзяляць спецыфічныя рэчывы (сакрэты), неабходныя для нармальнай жыццядзейнасці арганізма або яго сістэм. Дзейнасць З. рэгулюецца перавай сістэмай і гумаральнымі механізмамі. Адны сакрэты (слізь, тлушчавая змазка) укрываюць паверхню цела ці абалонкі ўнутр. органаў (дыхальны шлях, стрававальны тракт) і ахоўваюць ад шкоднага ўплыву знешняга асяроддзя, другія ўплываюць на абмен рэчываў у арганізме або маюць у сваім саставе рэчывы, якія павінны выдаляцца з арганізма; стрававальныя ферменты садзейнічаюць пераварэнню яды. Ёсць сакрэты З., якія служаць харч. прадуктамі (напр., *малако*).

Адрозніваюць З. знешняй сакрэцыі (экзакрынныя), якія выдзяляюць сакрэт на паверхню цела ці ў поласць органа (стрававальны, потавыя З.), і З. ўнутранай сакрэцыі (эндакрынныя) — выдзяляюць інкрэты (гармоны) у кроў ці ў лімфу (надныркавікі, гіпофіз, шчытападобная З.). Ёсць З. са змешанай сакрэцыяй (напр., падстраўнікавая). Аднаклетачныя З. пашыраны ў покрывах многіх беспазваночных (у вышэйшых пазваночных і ў чалавека гэта бакалападобныя клеткі ў тоўшчы эпітэлію дыхальных шляхоў і кішэчніка, якія выдзяляюць слізь). Шматклетачныя З.— у саставе органаў (напр., потавыя і тлушчавыя З. скуры) або самастойныя анатамічныя органы (падстраўнікавая, вялікія слінныя З.). Яны складаюцца з канцовых (сакраторных) аддзелаў у выглядзе пузыркоў (альвеалярныя) або трубачак (трубчастыя), усланых залозістымі клеткамі, і з вывадных пратокаў, якія выдаляюць сакрэт з канцовых аддзелаў (іншы раз, напр. у слінных З., удзельнічаюць у сакрэцыі). Паводле спосабу сакрэцыі адрозніваюць апакрынавыя З. (сакрэт выдзяляецца разам з верхавінкавай часткай клеткі, у якой ён назапашваецца, напр., малочныя і некат. потавыя З.); меракрынавыя З. (клеткі выдзяляюць сакрэт і не пашкоджваюцца) і галакрынавыя З. (гінуць і распадаюцца ўсе клеткі, напоўненыя сакрэтам, напр., ядавітыя, скурныя З. амфібій, тлушчавыя З.). Клеткі ўзнаўляюцца за кошт дзялення клетак, якія засталіся ў канцовых аддзелах.

Літ.: Гистология, М., 1963; Рябов К. П. Гистология с основами эмбриологии, Мн., 1968; Бабкин Б. П. Секреторный механизм пищеварительных желез, Л., 1960. *А. В. Пішчынскі.* Мінск.

ЗАЛУ́ЖЖА, вёска ў Дражнаўскім с/с Старадарожскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Залужжа». За 18 *км* на ПнУ ад Старых Дарог, 130 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе Старыя Дарогі — в. Дрычын. 1210 ж., двароў 475 (1971). Лясніцтва, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1920 вёску часткова спалілі польскія акупанты, загубілі 15 мірных жыхароў. Помнік на брацкай магіле 18 сав. воінаў і партызан, мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 161 земляка, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАЛУ́ЖЖА, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 12 *км* на ПдЗ ад Стоўбцаў, 90 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе Стоўбцы — г. п. Мір. 468 ж., гасп. 162 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1941 вёску часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Помнік 80 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЛУ́ЖЖЫНЕ, сяўба лугапашавых травасумесей для стварэння культурных сенажацяў і пашы ў працэсе карэннага паляпшэння прыродных кармавых угоддзяў.

На Беларусі на ўчастках з добраспрацаванай дзярнінай робяць паскоранае З. (сеюць травы па распрацаванай цаліне без сляды папярэдніх пасяўных культур). Пры карэнным паляпшэнні лугоў з тоўстай дзярнінай перад З. высяваюць запар 1–2 гады палявыя культуры (азімае жыта, лён, проса, пей сеюць травасумесі над покрыва адпагадовых траў або збожжавых культур, якія ідуць на зялёны корм. На тарфяна-балотных глебах робяць беспокрыўнае З. ад вясны да восені. У выніку карэннага паляпшэння малапрадукцыйных лугоў ураджай сена дасягае 100 *ц/га* і больш.


Літ.: Кормовые угодья БССР и их улучшение, Мн., 1956. *Я. У. Рудэнка.* Мінск.

ЗАЛЬВЯ́НКА, рака, левы прыток Нёмана. Даўж. 170 *км*. Цячэ ў Свіслацкім, Ваўкавыскім, Пружанскім, Зэльвенскім і Мастоўскім р-нах Гродзенскай і Брэсцкай абл. Вадазбор (1940 *км*²) размешчаны на ўсх. схілах Ваўкавыскага ўзв. Даліна ракі глыбокая, шыр. ад 25–50 *м* да 4–7 *км*. Берагі нізкія. У вярхоўі шырыня 2–6 *м*, у нізоўі 20–40 *м*. Асн. прытокі Сасна (злева), Шчыба і Ружанка (справа). Ледастаў з сярэдзіны снеж. да сярэдзіны сакавіка. Жыўленне мяшанае. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці больш за 10 *м*³/*сек*. Каля вёсак Сядзельнікі, Галоўчыцы, Зіновічы, Каралін, Пескі — плаціны. На З.— г. п. Зэльва, г. Масты (каля вусця).

ЗА́ЛЬКАЛН (Zo]kalns; сапр. Грынберг) Тэадор Эдуардавіч [н. 18(30).11.1876, хутар Заляйскалн Рыжскага пав. Ліфляндскай губ., латышскі савецкі скульптар. Нар. мастак СССР (1957). Правадз. чл. АМ СССР (з 1947), праф. (з 1947). Вучыўся ў вучылішчы Штыгліца ў Пецярбургу (1893–99), потым у Парыжы (1899–1901) у А. Радэна. У 1919 удзельнічаў у ажыццяўленні ленінскага плана манументальнай прапаганды (помнікі Л. А. Бланкі, М. Чарнышэўскаму і інш. у Петраградзе). З 1920 у Рызе. Работы: помнікі А. Кронвалду (1938), А. Гулбісу (1939), партрэты Ф. Я. Блумбаха (1951), А. Я. Калнына, фігуры «Ягня» (1933), «Торс» (1936) і інш. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырв. Сцяга.

Літ.: Бауман К. Теодор Эдуардович Залькалн, М., 1960.


ЗАЛЯ́ (Zola) Эміль (2.4.1840, Парыж — 29.9.1902), французскі пісьменнік. Сын інжынера-ірыгатара, італьянца па паходжанні. Вучыўся ў калежы ў г. Экс, з 1858 у ліцэях Парыжа. У ранніх творах (казка «Фея кахання», 1859; «Казкі Нінон», 1864) адчуваецца ўплыў рамантызму. У арт. «Эксперыментальны раман» (1880), «Раманісты-натуралісты» (1881) і інш. выклаў тэорыю натуралізму. Творчасць З. шырэйшая за яго эстэт. дэкларацыі і па сутнасці — разнавіднасць крытычнага рэалізму. У серыі з 20 раманаў «Ругон-Макары, Натуральная і сацыяльная гісторыя адной сям'і ў эпоху Другой імперыі» (1871–93) рэалістычна паказаў капіталіст. прыгнёт і бязрадаснае жыццё сац. нізоў («Пастка», 1877; «Жэрміналь», 1885), выкрываў фінансавую алігархію («Грошы», 1891), антыпатрыятызм і здрадніцтва франц. буржуазіі ў час франка-прускай вайны («Разгром», 1892). Аўтар трылогіі «Тры гарады» («Лурд», 1894; «Рым», 1896; «Парыж», 1898) і незакончанай тэтралогіі «Чатыры евангеллі» («Плоднасць», 1899; «Праца», 1901; «Ісціна», 1903; раман «Справядлівасць» не напісаны). У 1898 у адкрытым пісьме да прэзідэнта Французскай рэспублікі «Я абвінавачваю» па справе Дрэйфуса, незаконна асуджанага ваен. судом, выступіў супраць клерыкальнай і ваен. рэакцыі. Супрацоўнічаў у пецярбургскім час. «Вестник Европы» (1875–80). Творчасць З. высока цанілі У. І. Ленін, Н. К. Крупская, М. Горкі, А. В. Луначарскі.



Тв.: Бел. пер.— Апавяданні, Мн., 1937; Пастка, Мн., 1939; Разгром, Мн., 1941; рус. пер.— Собр. соч., т. 1–26, М., 1960–67.

Літ.: Барбюс А. Золя, пер. [з франц.], М.— Л., 1933; Клеман М. и Ренов Б. Эмиль Золя, Л., 1940; Пузиков А. Н. Эмиль Золя. Очерк творчества, М., 1961; Ягож. Золя, М., 1969; Бернштам Л. Г. (сост.). Э. Золя. 1840–1902. Указатель литературы, Л., 1940; Лану А. Здравствуй, Эмиль Золя!, пер. с франц., М., 1966.


ЗАЛЯГА́ННЕ ГО́РНЫХ ПАРО́Д, прасторавае размяшчэнне горных парод у зямной кары. У залежнасці ад паходжання (генезісу) розныя групы і тыпы парод утвараюць геал. целы розных памераў і формаў.



Залягание асадкавых горных парод: *а* — адпаведнае гарызантальнае; *б* — адпаведнае дыслакаванае; *в* — неадпаведнае гарызантальнае; *г* — неадпаведнае дзвюх серый дыслакаваных парод.

Асадкавыя горныя пароды пашыраны на плошчы пластамі. Спачатку пласты залягаюць гарызантальна. У выніку тэктанічных рухаў і інш. працэсаў гарызантальнасць пластоў парушаецца. Яны набываюць нахіл, змінаюцца ў складкі ці нават разрываюцца (гл. *Складкі горных пород, Дыслакацыі, Разрывы тэктанічныя*). Сістэма нахіленых у адзін бок пластоў утварае моноклінальнае залягание, ці монокліналь. Пры характарыстыцы становішча пласта ў прасторы адрозніваюць наст. элементы залягання пласта: прасцяг (лінія перасячэння паверхні пласта з гарыз. плоскасцю), падзенне (вугал нахілу і напрамак нахілу пласта, перпендыкулярны лініі прасцягу) і магутнасць пласта. Пластам горных парод марскога паходжання характэрны ўстойлівыя магутнасці. Калі пласт на невялікай плошчы мае вельмі зменлівую магутнасць, паступова выкліньваецца, ён набывае форму лінзы. Лінзападобнае залягание характэрнае кантынентальным (азёрным, балотным і інш.) тоўшчам. Адрозніваюць згоднае залягание, калі больш маладыя пласты паслядоўна залягаюць на старажытных без перапынку, і незгоднае, калі нармальная паслядоўнасць у залягані пластоў парушаецца перарывамі ў асадканапамажэнні з прычыны тэктанічных рухаў або мясцовых размываў пачванняў, апаўзаннямі і інш. Незгоднасці ў залягані падзяляюць на стратыграфічныя, або паралельныя, калі больш маладыя пароды залягаюць на размытай паверхні гарыз. пластоў (з выпадзеннем часткі разрэзу), і вугласты, калі больш маладыя пароды ляжаць на паверхні размыву дыслакаваных парод.

Магматычныя горныя пароды залягаюць у форме разнастайных геал. целаў, утвораных з застылай магмы. Вял. масы магмы, якая прарывае ўмяшчальныя пароды, утвараюць вялізныя (да некалькіх соцень кіламетраў у папярочніку) масівы — баталіты. Масівы значна меншых памераў, звычайна блізкіх да цыліндрычнай формы, наз. штокамі. Часам магма утварае паміж гарыз. пластамі пластападобныя целы — сілы, паміж змятымі ў складкі пластамі — караваепадобныя лакаліты, лінзападобныя выгнутыя факаліты і прагнутыя лапаліты. Пры запаўненні шчылін утвараюцца дайкі і жылы. Калі магма выліваецца на паверхню (гл. *Вулканізм, Вулканы*), яна ўтварае купалы, лававыя патокі і покрывы (гл. рыс.). Метамарфічныя горныя пароды залягаюць масівамі на вял. плошчах, ахопленых працэсамі рэгіянальнага метамарфізму, часткова захоўваючы рэлікты формаў залягання першасных парод. Найчасцей утвараюць зоны парод рознага саставу з невыразнымі межамі і паступовымі пераходамі паміж імі (адпаведна ступеням метамарфізму). Да іх належаць таксама зоны кантактавых ареолаў вакол інтрузіўных целаў (гл. *Скарн, Грэйзен*). З. г. п. вывучае раздзел геатэктонікі — *структурная геалогія*.



Заляганне магматычных горных парод: *1* — баталіт; *2* — шток; *3* — сіла; *4* — лакаліт; *5* — факаліт; *6* — лапаліт; *7* — дайка; *8* — кольцавая дайка; *9* — жыла; *10* — лававы паток; *11* — лававае покрыва; *12* — ареол кантактавага метамарфізму вакол інтрузіўных целаў.

Літ.: Ажгирей Г. Д. Структурная геология, 2 изд., М., 1966; Косыгин Ю. А. Тектоника, М., 1969; Бащарин А. К. Типы несогласного залегания слоев, «Геология и геофизика», 1961, № 9; Богданов А. А. Несогласия, их типы и значение их изучения, «Известия АН СССР. Сер. геол.», 1949, № 2. *У. І. Шкуратаў.* Мінск.

ЗАЛЯСО́ЎШЧЫНА, вёска ў Такарышкоўскім с/с Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 40 *км* на ПнУ ад Іўя, 198 *км* ад Гродна, 6 *км* ад чыг. ст. Багданаў, каля шашы Іўе — Мінск (3 *км*). 180 ж., гасп. 61 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗАЛЯША́НЫ, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Запаветы Ільіча». За 10 *км* на ПдЗ ад Клецка, 150 *км* ад Мінска, 12 *км* ад чыг. ст. Клецк. 343 ж., двароў 117 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 9 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗА́МАК, умацаванае жыллё феадала, а таксама абарончы фарпост (горада, ордэна). З. ставіліся звычайна ў зручных для абароны месцах (абкружаных вадой, у гарадах і г. д.). Палісады, валы, равы, масіўныя сцены з вежамі ўскладнялі доступ да *данжона* — гал. вежы, якая служыла жыллём і апошнім рубяжом абароны.

Раннія З., што засталіся на тэр. Сярэдняй Азіі (5—8 ст.), Арменіі (7—8 ст.), Іарданіі (8 ст.),

Францыі (9—11 ст.) і інш. краін, маюць глухія моцныя сцены, развічаныя на насіўную абарону. Прамавугольныя планы такіх З., іх буд. і канструктыўныя асаблівасці спалучаюць мясцовыя, эліністычныя і старарымскія традыцыі абарончага дойлідства. З пераходам да тактыкі актыўнай абароны (З. крыжакоў у Сірыі і Палесціне, 11—12 ст.) лініі сцен страчваюць рэгулярнасць, дапасоўваюцца да рэльефу мясцовасці, на сценах і вежах напаўляюцца навясныя (машыкулі) і вынасныя (барбаканы) байніцы, каб скідваць камяні і абстрэльваць ніжнюю частку сцен. Паступова З. ператвараюцца ў складаныя комплексы абарончых збудаванняў, жылых, культавых, гасп. пабудоў (замак




Схема ўмацаванняў сярэдневяковага замка (Бург Швальбах; сярэдзіна 14 ст.): *1* — данжон; *2* — палац; *3* — капліца; *4* — гаспадарчыя пабудовы; *5* — двор; *6* — вежы; *7*, *13* — воінкавыя абарончыя сцены; *8* — зубцы; *9* — байніцы; *10* — бакавыя вароты; *11* — пад'ёмны мост; *12* — унутраныя абарончыя сцены. *14*. План Мірскага замка (на мяжы 15—16 ст.).

Кусі ў Францыі, Харлеч у Англіі, абодва 13 ст.), якія ўтвараюць крапасныя замкавыя ансамблі. З распадам феадалізму, з развіццём артылерыі З. трацяць значэнне крэпасці, гал. роля ў іх кампазіцыі належыць палацу. Паступова замкі выцясняюцца гарадскімі і загарадным палацава-паркавымі комплексамі.

З.— адзін з відаў сярэдневяковых абарончых збудаванняў на Беларусі. Замкамі часта называлі агульнагарадскія цытадэлі (гл. арт. *Гродна, Гродзенскі Стары замак, Полацк, Віцебск*). У 15—16 ст. пашыраны З.— прыватнаўласніцкія феад. рэзідэнцыі. У працэсе эвалюцыі шэраг іх *(Жабер, Быхаўскі замак, Мірскі замак, Нясвіжскі замак)* у 17—18 ст. ператвараецца ў замкава-палацавыя комплексы. Да 15 ст. вядомы 2 тыпы замкаў: разнастайныя па абрысах З. на ўзвышшах, план іх паўтараў на складаным рэльефе канфігурацыю занятага ўчастка (Гродна), і З. позняга тыпу (звычайна з рэгулярнай планіроўкай), размешчаныя ў нізінах, з развітай сістэмай абводнення *(Геранёнскі замак)*. Замкі будавалі з каменю і дрэва (Орша, Радашковічы). Быў пашыраны спосаб трохслаёвай муроўкі: 2 цагляныя сцяны і забутоўка паміж імі (з дробнага каменя і бітай цэглы, залітай вапнавым растворам). Драўляныя З. не зберагліся (Пінскі замак, замак кн. М. Чартарыйскага ў Гомелі і інш.). Сярод мураваных замкаў 13—17 ст. *Лідскі замак, Любчанскі замак, Крэўскі замак, Навагрудскі замак, Смаляніскі замак*, замкі ў Гродне, Міры, Гальшанах, Быхаве і інш. Многія З. ў 17—18 ст. рэканструяваліся, дабудоўваліся, абкружаліся паркамі (Нясвіж). У замкавым буд-ве Беларусі відаць сувязі з рус. і зах.-еўрап. фартыфікацыйным мастацтвам. У асобных З. трапляюцца элементы раманскай архітэктуры (Ліда), у большасці замкаў 15—16 ст.— рысы готыкі (своеасаблівая муроўка, стральчатыя крыжовыя скляпенні ці скляпенні з нервюрамі, стральчатыя аркі вокнаў і дзвярэй). У 17 ст. ў З. пераважаюць рысы барока. Уплыў замкавага дойлідства відаён у 16—19 ст. у архітэктуры многіх цэркваў *(Мамамажэйкаўская царква-крэпасць)*, касцёлаў *(Камайскі касцёл)*, сінагог *(Быхаўская сінагога)*, дамоў-крэпасцей *(Гайцюніскі дом-крэпасць)*, гарадскіх брамаў (Магілёў), сядзібных дамоў (Пораззва), якім характэрныя вежавыя кампазіцыі. На Беларусі замкамі часта называлі і палацы 18 ст. *(Гродзенскі Новы замак)*. Гл. таксама *Вежа, Замчышча, Крэмль, Крэпасць*.

Літ.: Всеобщая история архитектуры, т. 4, Л.—М., 1966, с. 101—104, 397—401; т. 6, М., 1968, с. 457—463, 469—483; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии, Мн., 1969, с. 25—68; Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии, М., 1954; Кацер М. С. Белорусская архитектура, Мн., 1956; Fedden R. Crusaders castles, London, 1950; Turnbse A. Burgen des Abendlandes, Wien—München, 1958. *У. А. Чантурыя* (замкі Беларусі). Мінск.

ЗАМАН, вельмі ядавітае атрутнае рэчыва нервова-паралітычнага дзеяння, фторангідрыд пінакалінавага эфіру метылфасфонавай кіслаты.

Высокалятучая вадкасць з пахам камфары; шчыльн. 1013 *кг/м*³; добра раствараецца ў арган. растваральніках, гаручых і змазачных матэрыялах, дрэнна — у вадзе. Пранікае ва ўсе пористыя паверхні і гумава-тэхнічныя вырабы. Выклікае атручэнне арганізма чалавека, смяротальная доза каля 0,075 *мг/л* за 1 *мін*, пры нападанні ў кроў чалавека — 0,4—0,6 *мг*. Ахова — процівагаз і спец. вопратка; дэгазацыя праводзіцца водным растворам NH_3 і аміначаў. Гл. таксама *Атрутныя рэчывы*.

ЗАМАРАЗКІ, часовае панІжэнне тэмпературы паверхні глебы і прыземнага слоя паветра да 0 °С і ніжэй у цёплы перыяд года.

Бываюць адвектыўныя (узнікаюць ад уплыву халоднага арктычнага паветра) і радыяцыйныя (начное ахаладжэнне паверхні глебы і расліннасці, якое бывае ў ясныя і ціхія ночы, калі эфектыўнае выпрамяненне з паверхні глебы вялікае, а турбулентнасць нязначная і халоднае паветра не пераносіцца ў больш высокія слаі; назіраецца найчасцей у нізінах і ў цэнтр. частцы антыцыклонаў). Звычайна З. адвектыўна-радыяцыйныя. Вельмі шкодзяць садоўніцтву і агародніцтву, асабліва позняй вясной. На Беларусі да выш. 2 *м* З. магчымы ўсё лета, акрамя ліпеня; на паверхні асушаных тарфяна-балотных глебаў і ў нізовінах яравету бываюць і ў ліпені.

Літ.: Гольцберг И. А. Агроклиматическая характеристика заморозков в СССР и методы борьбы с ними, Л., 1961.

ЗАМАСТО́ЧЧА, вёска ў Віцебскім р-не, каля р. Лучоса (1 *км*); чыг. ст. на лініі Віцебск—Орша. Цэнтр сельсавета і калгаса «Замасточчча». За 20 *км* на Пд ад Віцебска. 422 ж., гасп. 170 (1971). Майстэрня камбіната быт. абслугоўвання, пякарня. Сярэдняя школа імя Героя Сав. Саюза У. А. *Канавалёнкі*, клуб, урачэбны пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, 3 магазіны. Помнік у гонар подзвігу Герояў Сав. Саюза лейтэнанта М. І. *Дружыніна* і групы салдатаў 61-га гвардз. стралковага палка, якія захапілі мост цераз р. Лучосу, забяспечылі хуткую пераправу войск 5-га гвардз. стралковага корпуса. Помнік на брацкай магіле 36 сав. воінаў і помнік на магіле л-та А. Дз. Падзько, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАМАСТО́ЧЧА, вёска ў Вягомльскім насялунктам Савеце Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Ленінскі шлях». За 40 *км* на ПдУ ад Докшыц, 177 *км* ад Віцебска, 51 *км* ад чыг. ст. Параф'янава, на шашы Лепель — Мінск. 312 ж., двароў 91 (1971). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. 29.5.1943 нямец.-фаш. захопнікі ў час карнай аперацыі «Котбус» амаль поўнасцю спалілі вёску. Помнік 47 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАМАСТО́ЧЧА, вёска ў Абчацкім с/с Мінскага р-на. Цэнтр саўгаса «Мінскі». За 24 *км* на ПдУ ад Мінска, каля шашы г. Смалявічы — в. Самахваловічы (1 *км*). 406 ж., гасп. 103 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, дзіцячыя яслі-сад, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

ЗАМАЦАВА́ННЕ ГРУНТО́Ў, штучнае павышэнне трываласці і воданепранікальнасці грунтоў у прыродным заляганні.

Робіцца *цементацыяй*, *глінізацыяй*, *бітумізацыяй* (нагнятаванне бітуму пад ціскам у шчыліны і поры грунту), *сілікатызацыяй* (нагнятаванне ў грунт сілікатных растворaў), дзеяннем эл. току, нагрэваннем, замарожваннем. Пашырана пры буд-ве гідратэхн. збудаванняў, шахтаў, тунеляў.

Літ.: Аскалонов В. В. Силикатизация лессовых грунтов, М., 1959; Леонович И. И. и Врублевский В. И. Использование полимерных материалов для укрепления грунтов в дорожном строительстве, «Известия АН БССР. Сер. физ.-техн. наук», 1970, № 4; Мищенко И. Ф. и др. Химическое укрепление грунтов в аэродромном и дорожном строительстве, М., 1967.

ЗАМАЦАВА́ННЕ ФАТАГРАФІ́ЧНАЕ (фіксаванне), выдаленне непраяўленага галоіднага серабра з святлоадчувальнага слоя фатаграфічных матэрыялаў (плёнак, пласцінак, паперы), каб атрымаць фатаграфічную выяву, устойлівую да дзеяння святла. Робіцца пасля *праяўлення фатаграфічнага*; дасягаецца хім. апрацоўкай фотаматэрыялаў у фіксажы (замацавальніку) з наступнай прамыўкай водой.

Літ.: Микулин В. П. Фотографический рецептурный справочник, 3 изд., М., 1969; Бунимович Д. З. Практическая фотография, 2 изд., М., 1969.

ЗА́МАЧАК, вёска ў Антапольскім с/с Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Усвейка. Цэнтр саўгаса «Сабалі». За 27 *км* на ПдУ ад Чашнікаў, 122 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Вятны, на шашы в. Чарэя — в. Пуські. 209 ж., двароў 63 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, дзіцячыя яслі-сад, сталовая, магазін. Помнік савецкім воінам, якія загінулі ў Айчынную вайну.

ЗАМАШЭ́ННЕ, вёска ў Пліскім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Кастрычнік». За 46 *км* на У ад Бешанковіч, 35 *км* ад Віцебска. 220 ж., гасп. 65 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ЗАМБЕ́ЗІ (Zambezi), рака ў Паўд. Афрыцы. Даўж. 2660 *км*, пл. бас. 1330 тыс. *км*².

Пачынаецца з плато Лунда на выш. каля 1100 *м*. На працягу 1200 *км* цячэ па слабанахіленай раўніне, утвараючы парогі і вадаспады: найбольшы — Вікторыя, шыр. 1600—1800 *м*, выш. 120 *м*. Да вусця р. Луангва З. цячэ па горнай мясцовасці ў вузкай (да 40—60 *м*) скалістай даліне; ніжэй г. Тэтэ выходзіць на прыморскую нізіну; упадае, утвараючы дэльту (каля 8 тыс. *км*²), у Мазамбікскі пралІў (Індыйскі ак.). Гал. прытокі Кабомпа, Кафуэ, Луангва, Шырэ — злева, Лунгвебунгу і Кванда — справа. Разводдзе ад дажджоў у студзені — чэрвені. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 16 тыс. *м*³/*сек*. Суднаходная паміж гарадамі Зумба і Шыкоа (250 *км*), ад г. Тэтэ да вусця (450 *км*). Патэнцыяльныя гідраэнергаресурсы (137 млн. *квт*) выкарыстоўваюцца слаба. У 1959 на З. створана вадасх. Карыба (даўж. 280 *км*, пл. 5200 *км*², аб'ём 1,66 млрд. *м*³), магутнасць ГЭС Карыба 1,2 млн. *квт*.

Літ.: Дмитревский Ю. Д. Внутренние воды Африки и их использование, Л., 1967.

ЗАМБІЯ, Рэспубліка Замбія (Zambia), краіна ва ўнутранай частцы Паўд. Афрыкі. Пл. 752,6 тыс. *км*², нас. 4208 тыс. чал. (1969). Сталіца Лусака. Краіна падзяляецца на 8 правінцый. Уваходзіць у склад Садружнасці нацый на чале з Вялікабрытаніяй. Дзейнічае канстытуцыя 1964 (са зменамі 1968). На чале дзяржавы і ўрада — прэзідэнт, які выбіраецца на 4 гады. Заканадаўчы орган — парламент. Выканаўчы орган — кабінет міністраў.




Прырода. Амаль усю краіну займае хвалістае пласкагор'е выш. 1000—1500 *м*, складзенае з дакембрыйскіх гранітаў, гнейсаў, крышталічных сланцаў. На У горы Мучынга (выш. да 1893 *м*, г. Мумпу). З. мае запасы медзі сусв. значэння (частка т. зв. «Меднага пояса» на граніцы з Дэмакр. Рэспублікай Конга). Ёсць кобальт, ванадый, уран, золата, поліметалы, жалеза, кам. вугаль. Клімат субэкватарыяльны з дажджлівым летнім (з ліст.— снеж. да сак.— крас.) і сухім зімовым перыядам. Сярэдняя т-ра самага цёплага месяца (кастр.) каля 20—25, самага халоднага (ліп.) каля 15—20 °С. Ападкаў 750—1000 *мм* за год. Рачная сетка густая. Акрамя Замбезі з прытокамі Кафуэ, Луангва і інш. на Пн вытокі Конга з азёрамі Бангвеулу і Мверу, паўд. ч. воз. Танганьіка. Ёсць парогі і вадаспады (вадаспад Вікторыя на Замбезі, шырыня патоку да 1,8 *км*, вышыня падзення 120 *м*). Агульныя запасы гідраэнергіі больш за 50 млн. *квт*. Пераважае саванавая расліннасць на чырвона-карычневых глебах. Жывёльны свет разнастайны: пашыраны буйныя траваедныя — сланы, насарогі, буйвалы, зебры, жырафы, антылопы; драпежнікі — ільвы, леапарды, гіены. Шмат птушак, насякомых. У рэках бегемоты і кракадзілы. Найб. запаведнік — нац. парк Кафуэ.

Насельніцтва. Каля паловы насельніцтва прыпадае на народы групы цэнтральных банту: бемба і тонга. З інш. груп банту жывуць малаві (на У), балунда (ПнЗ), балозі (ПдЗ) і інш. Еўрапейцаў каля 80 тыс., пераважна англічане. Дзярж. мова англійская, але шырока карыстаюцца мясцовымі мовамі. Веруючыя прытрымліваюцца пераважна мясцовых традыц. культаў, хрысціяне каля 1 млн. Гарадскога нас. 25%, ²/₃ яго жыве ў гарадах «Меднага пояса»: Кітве-Нкана, Ндола, Муфуліра, Луанш'я і інш.; у Лусацы 238,2 тыс. ж. (1969).

Гістарычная даведка. Тэр. З. населена з часоў сярэдняга палеаліту. Адно з найстаражытнейшых

месцаў апрацоўкі жалеза на зямным шары. Раннефеад. дзяржавы плямёнаў лозі, лунда ўзніклі ў 18—19 ст. З 1889 паводле хартыі англ. кароля пад уладай Брытанскай паўднёваафрыканскай кампаніі, засн. С. Родсам (адсюль назва З. да 1964 Паўн. Радэзія). У 1924 абвешчана пратэктаратам Англіі. У 1953 увайшла ў склад Федэрацыі Радэзіі і Ньясаленда. Рабочы і нац.-вызв. рух узначаліла Аб'яднаная партыя нац. незалежнасці (ЮНІП; створана ў 1959). У студз. 1964 З. атрымала ўнутр. самакіраванне. 24.10.1964 абвешчана незалежнай у складзе брытанскай Садружнасці нацый. Прэзідэнтам краіны стаў лідэр ЮНІП К. Каунда (перавыбраны ў 1968). Урад З. ліквідаваў расавую дыскрымінацыю, праводзіць афрыканізацыю ва ўстановах, у арміі, на вытворчасці. Ажыццявіў шэраг мерапрыемстваў для эканам. незалежнасці ад Паўд. Радэзіі, замежных манаполій. На міжнар. арэне З. трымаецца палітыкі недалучэння. З ліст. 1964 чл. ААН. У 1964 устанавіла дыпламат. адносіны з СССР. У 1966 З. заключыла пагадненне аб культ. і навук., у 1967 — аб эканам. і тэхн. супрацоўніцтве з СССР.

Гаспадарка. Рэспубліка атрымала ў спадчыну ад калан. часу аднабаковую эканоміку, арыентаваную на вытворчасць медзі для капіталіст. рынку. Горназдабыўная прамысловасць дае па кошце каля паловы валавой прадукцыі і 90% экспарту краіны (1968). Медную руду распрацоўваюць дзве групы замежных кампаній пераважна з англ. капіталам. З 1968 ім дазваляецца пераводзіць за мяжу толькі 50% дывідэндаў, павялічыўся падаходны падатак з кампаній. Дзяржаве перайшоў за выкуп 51% акцый 2 горнарудных кампаній. Медзездабыўным кампаніям тэрмін арэнды руднікоў абмежаваны 25 гадамі. У 1968 здабыта 684,9 тыс. *т* медзі (2-е месца ў капіталіст. свеце пасля ЗША), выплаўка і вытворчасць рафінаванай медзі на з-дах у Луанш'і, Кітве-Нкане, Муфуліры, Чынголе, Ндоле. Здабываецца (1968, тыс. *т*): цынку 67,3, свінцу 22,7, марганцавай руды 9,6, кобальту (канцэнтрату) 1,3. ГЭС Карыба на



Замбія. Медзеплавільны і рафінажны завод у Кітве-Нкане.

Замбезі (магутнасць 1200 тыс. *квт*) дае каля 70% эл. энергіі, якая выкарыстоўваецца гаспадаркай Замбіі. ГЭС — агульная ўласнасць Паўд. Радэзіі і З.; будынак ГЭС на тэр. Паўд. Радэзіі. ЦЭС у вялікіх гарадах. Будуецца (1971) ГЭС на р. Кафуэ. Апрацоўчая прамысловасць — невялікія млыны, бойні, малаказаводы, рамонтныя майстэрні, пераважна ў раёне «Меднага пояса». Ёсць аўтазборачны з-д (Лусака), хім. прадпрыемствы (Кітве-Нкана), лесакамбінат (Лівінгстан), веласіпедная ф-ка (Муфуліра), цэментны з-д (Чыланга), прадпрыемствы па апрацоўцы арахісу і цукру-сыраду (Ндола). Агульная пл. с.-г. земляў 5,2 млн. *га*, пад ворывам каля 1,25—1,5 млн. *га*. Вылучаюцца 2 сектары: афрыканскі — каля 0,5 млн. гасп. (на 1 гасп. прыпадае каля 2,5 *га*), вытворчасць харч. культур на свае патрэбы; еўрапейскі — 1100 буйных фермаў (на 1 ферму прыпадае каля 1000 *га*) па вытворчасці пераважна тытуню (на экспарт) і кукурузы. Пасля заваявання незалежнасці створаны першыя дзяржгасы, эксперым. фермы, расшыраецца сетка кааператываў. На канец 1968 у краіне было 1067 с.-г. кааператыўных т-ваў. Сялянам памагаюць набываць тэхніку, асвойваць новыя землі. Усяго сабрана (1967/68, тыс. *т*): кукурузы 376, тытуню 7, бавоўны 1,8, арахісу 0,4. Жывёлагадоўля развіта слаба (шкодзіць муха цэцэ). У 1968/69 налічвалася 1,4 млн. галоў буйн. раг. жывёлы; коз, авечак і свіней у 1967/68 каля 700 тыс. Развіваецца птушкагадоўля. Штогод ловяць каля 30 тыс. *т* рыбы. Аснова трансп. сеткі — адзіная чыгунка Ндола — Лівінгстан з некалькімі адгалінаваннямі; агульная даўж. 1045 *км*. Аўтамаб. дарог 34,4 тыс. *км*. Будуецца чыгунка Капіры-Мпошы — Дар-эс-Салам (1,7 тыс. *км*), пабудаваны нафтапровад Дар-эс-Салам — Ндола (1693 *км*). З. вывозіць медзь, поліметалы, кобальт, тытунь; увозіць нафтапрадукты, хім. і харч. тавары, горнае і трансп. абсталяванне. Гандаль пераважна з Вялікабрытаніяй і інш. членамі Садружнасці нацый, з краінамі «Агульнага рынку». Расце гандаль з Танзаніяй, Кенійй, Угандай, Дэмакр. Рэспублікай Конга; меншае залежнасць ад ПАР і Паўд. Радэзіі. Грашовая адзінка — квача.


ЗАМБІЯ
Маштаб 1:21 000 000
210 0 210 420 км
ТАНЗАНІЯ
КОНГА
ЛУСАКА
ПАЎДНЕВАЯ
ЗАМБІЯ
БАТСВАНА
Кітве-Нкана
Ндола
Муфуліра
Чынгола
Лівінгстан
Солсберы
Карыба
Замбезі
Мазабука
Чыланга
Капіры-Мпошы
Кабве
Чылата
Манкола
Лікасі
Луанш'я
Мулунгу
Мпуланга
Мпіка
Мумбва
Катава
Монгу
Каміна
Кавэнді
Танка
Касэмпа
Мансо
Чомбэ
Салвэзі
Чынгола
Балавале
Кабомпо
Мвінілунга
Мпіка
Мумбва
Мпуланга
Мпіка
Мумбва
Мпуланга
Мпіка
Мумбва
Мпулан

ныя кірункі ў гістарыяграфіі расійскай мастацкай літаратуры XIX—XX ст., там жа, 1925, № 7; Паэма Я. Коласа «Сымон-музыка» як аўтахарактарыстыка, там жа, 1926, № 8; На пераломе, Мн., 1927; Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні, в. 1—2, Мн., 1927—28; Беларуская драматургія, [ч.] 1 — Драматычныя творы Я. Купалы, «Узвышша», 1927, № 1; М. А. Багдановіч. Крытыка-біяграфічны нарыс, там жа, 1927, № 2—3, 5; А. С. Пушкін. Нарыс жыцця і творчасці, Мн., 1937.

А. К. Гардзіцкі. Мінск.

ЗАМО́ШША, вёска ў Асіповіцкім р-не Магілёўскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 5 *км* на У ад Асіповіч, 138 *км* ад Магілёва, 0,5 *км* ад чыг. ст. Асіповічы 2-я. 336 ж., двароў 96 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 54 мірных жыхароў. Скульптурны помнік, помнікі на 4 магілах 26 сав. воінаў і 7 партызанаў, 3 мемарыяльныя дошкі на ўшанаванне памяці 171 земляка, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАМО́ШША, вёска ў Ахрэмаўскім с/с Браслаўскага р-на. Цэнтр калгаса «Партызан». За 20 *км* на Пд ад Браслава, 258 *км* ад Віцебска, 29 *км* ад чыг. ст. Шаркоўшчына, на аўтамаб. дарозе Браслаў — Шаркоўшчына. 275 ж., гасп. 93 (1971). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. 2 помнікі сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАМО́ШША, вёска ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобл. на р. Каросцінка. Цэнтр сельсавета. За 28 *км* на Пн ад Лельчыц, 243 *км* ад Гомеля, 67 *км* ад чыг. ст. Ельск. 834 ж., двароў 223 (1971). Лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 122 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну, мемарыяльная дошка на ўшанаванне іх памяці.

ЗАМО́ШША, вёска ў Дарасінскім с/с Любанскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Ударнік». За 25 *км* на ПнЗ ад Любані, 147 *км* ад Мінска, 14 *км* ад чыг. ст. Урэчча. 661 ж., двароў 206 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, адда. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАМУЛА́Е́Ў Міхаіл Апанасавіч (20.11.1924, в. Паляна Перамышльскага пав. Калужскай губ.— 27.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Магілёва. 27.6.1944 стралковы ўзвод на чале з З. першы пераправіўся цераз Дняпро і вызваліў в. Ніжні Палавінны Лог. Праследуючы ворага, З. першы ўварваўся ў Магілёў. Загінуў у баі. Пахаваны ў Магілёве. На радзіме героя яго імем названа школа.

ЗАМХАВА, вёска ў Зябкаўскім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Авангард». За 43 *км* на ПнУ ад Глыбокага, 165 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Зябкі. 89 ж., двароў 30 (1971). 8-гадовая і 1 пач. школы, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны.

ЗАМЧЫ́ШЧА, назва месца былой гарадской цытадэлі або феад. замка. У спец. літаратуры З. называюць месцы з рэшткамі замкавых пабудоў, земляных валоў, равоў і інш., тэрыторыю ўмацаваных паселішчаў, невялікіх крэпасцей. У стараж. гарадах З. часта называлі месца былога *дзядзінца*. Часам З. атаясамліваюць з паняццямі *гарадзішча, замак*, замэчак. На Беларусі найб. даследаваныя З. ў Мінску, Ваўкавыску і інш.

Э. М. Загарульскі. Мінск.

ЗА́МШЫНА, вёска ў Веляшковіцкім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Віцебскі рабочы». За 19 *км* на Пн ад Лёзна, 58 *км* ад Віцебска, 20 *км* ад чыг. ст. Лёзна. 205 ж., двароў 94 (1971). Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАМЫКА́ННЕ ЭЛЕКТРЫ́ЧНАЕ, замыканне эл. ланцуга на вельмі малое (блізкае да нуля) супраціўленне. Гл. *Кароткае замыканне.*

ЗАМЫ́ШКІ, вёска ў Лясніцкім с/с Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 10 *км* на ПнУ ад Круглага, 83 *км* ад Магілёва, 11 *км* ад чыг. ст. Талачын. 138 ж., двароў 44 (1971). Клуб, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі.

ЗАМЯ́ЦІН Мікалай Мітрафанавіч [5(18).5.1900, г. Ліпецк — 12.7.1965], бел. савецкі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі. Чл.-кар. АН БССР (1947). Д-р с.-г. н. (1937). Скончыў Ленінградскі вет.-заатэхнічны ін-т (1923). У 1946—49 заг. аддзела жывёлагадоўлі Ін-та сацыялісц. с. гасп. АН БССР. У 1949—65 заг. кафедры развядзення с.-г. жывёлы Бел. с.-г. акадэміі і Гродзенскага с.-г. ін-та. Асн. працы па вывучэнні канстытуцыі с.-г. жывёл і падбору іх паводле прыкметаў стымулявання развіцця патомства; распрацоўваў пытанні ўзроставага і полавага падбору. Адзін з аўтараў пародных групы беларускіх чорна-рабых свіней. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.



Тв.: Принципы мичуринского учения в разведении животных, Мн., 1949.

ЗАН (Zan) Тамаш (21.12.1796, в. Мясота Навагрудскага пав.— 19.7.1855), польскі паэт-рамантык. Скончыў Мінскую гімназію (1815). Вучыўся на фіз.-матэм. і адначасова на літ.-фф-це Віленскага ун-та (1815—20). Адзін з арганізатараў т-ваў *шубраўцаў, філаматаў і філарэтаў*. У 1823 арыштаваны і высланы (1824) у Арэнбург. Там даследаваў флору і мінералы Урала, заснаваў мінералаг. музей. У 1837 адпушчаны ў Пецярбург, дзе працаваў бібліятэкарам у Горным ін-це. У 1841 пераехаў на радзіму, набыў маёнтак Кахачыны каля Оршы. На фарміраванне З. як паэта вялікі ўплыў зрабіў бел. фальклор. Аўтар кавялікі ўплыў зрабіў бел. фальклор. Аўтар медалі «Грэцкія піражкі» (1817), у якой даецца апісанне бел. вяселля, абраду Купалля, нар. вераванняў, у мове шмат беларускай лексікі, прыказак і фразеалагізмаў; балад «Твардоўскі», «Бекіш», «Свіцязь-возера», «Цыганка» і інш., лірычных вершаў. Быў слябрам А. Міцкевіча, зрабіў уплыў на яго паэт. творчасць, асабліва на балады.

Тв.: Triolety i wiersze miłosne, Warszawa, 1922; Z wygnania, Wilno, 1929.

Літ.: Dunajówna M. Dzieciństwo i lata szkolne Tomasza Zana, Wilno, 1932; ня ж. Tomasz Zan. Lata uniwersyteckie. 1815—1824, Wilno, 1933; Jankowski Cz. Czeczott i Zan w Leplu, у кн.: Z ziemi pagórków leśnych, z ziemi łąk zielonych, Warszawa, 1899.

Л. А. Малаш-Аксамітава. Мінск.

ЗАНАЛЬНАСЦЬ геаграфічная, заканамерная і паслядоўная змена прыродных комплексаў (ландшафтаў) і іх кампанентаў у залежнасці ад геагр. шыраты і вышыні мясцовасці над узр. мора.

Шыротная занальнасць абумоўлена нераўнамерным паступленнем сонечнага цяпла на Зямлю, *вышынная пояснасць* — заканамерным для трапасферы паніжэннем т-ры паветра з вышынёй (каля 0,6 °С на 100 м). Ускладняецца ад нераўнамернага размяшчэння сушы і мора, цыркуляцыі атмасферы, акіянічных цячэнняў і інш. Найбольш яскрава выражана *занальнасць глебаў*.

Літ.: Докучаев В. В. К учению о зонах природы, Избр. соч., М., 1954.

ЗАНАЛЬНАСЦЬ ГЛЕ́БАЎ, размеркаванне глебаў па зонах на зямной паверхні ў залежнасці ад прыродных фактараў.

Бывае гарызантальная (глебы ўтвараюць зоны, якія зменьваюць адна адну з Пн на Пд) і вышынная (змена глебаў у горных абласцях ад падножжа да верхавін гор). На тэр. СССР вылучаецца 7 глебавых зон: тундравая; дзярнова-падзолістая, або лесалугавая; лесастэпавая, або шэрых лясных глебаў; чарназёмная, або лугавастэпавая; каштанавых глебаў, або сухіх стэпаў; шараземная, або пустынных стэпаў; чырваназемная, або вільготных субтропікаў. Тэр. Беларусі ўваходзіць у дзярнова-падзолістую глебавую зону.

Літ.: Докучаев В. В. Учение о зонах природы и классификация почв, Соч., т. 6, М.— Л., 1951.

ЗАНАРА́Ч, вёска ў Мядзельскім р-не Мінскай вобл., на паўд. беразе воз. Нарач. Цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях да камунізма». За 25 *км* на ПдЗ ад Мядзела, 150 *км* ад Мінска, 40 *км* ад чыг. ст. Княгініна, на аўтамаб. дарозе в. Нарач — в. Брусы. 379 ж., гасп. 140 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі, бальніца, аптэка, вет. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Жыхары З. ўдзельнічалі ў *нарачанскіх рыбакоў выступленні 1935*. Помнік землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАНД Жорж, гл. *Санд* Жорж.

ЗА́НДРЫ (ад лац. sandur пясок), зандравыя раўніны, слабахвалістыя, месцамі забалочаныя раўніны водналедавіковага паходжання.

Утвараюцца пры зліцці краявых частак плоскіх конусаў выпасу падледавіковых патокаў. Форма абумоўлена рэльефам перадледавіковай мясцовасці: у нізінах — ізаметрычнай ці эліпсаідальнай формы; на раўнінах — шырокія палосы ўздоўж ледавіка; на ўзгоркавых мясцовасцях канфігурацыя З. разнастайная. Складзены з прадуктаў перамыву і пераадкладу расталымі водамі марэннага матэрыялу, пераважна з пяску і галькі. Незамацаваныя расліннасцю зандравыя пяскі нярэдка перавеяны ў дзюны. З. чацвярцічных абледзяненняў пашыраны ў Еўраз. ч. СССР (бас. Пячоры, Паўн. Дзвіны, у вярхоўі Волгі, Зах. Дзвіны і інш.), у Зах. Сібіры, Данії, ФРГ, ГДР і Польшчы; на Беларусі — у вярхоўі Бярэзіны, Вілі, у раёне Баранавіч. Сучасныя З. каля ледавікоў Ісландыі і Аляскі.

ЗАНЕ́ЎСКАЯ Марыя Віктараўна (н. 10.8.1934, в. Калейпікі Гродзенскага пав. Беластоцкага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Чл. КПСС з 1959. Прац. дзейнасць пачала ў калгасе «Новая праца» (з 1951 саўгас «Свіслач») Гродзенскага р-на. У 1950—66 даярка, з 1969 цялятніца гэтага саўгаса. Дэп. Вярх. Савета БССР 5-га скл.

ЗАНЗІБА́Р І ПЕ́МБА, астраўная частка Аб'яднанай Рэспублікі Танзаніі. Уключае а-вы Занзібар, Пемба і іншыя агульнаю пл. 2624 *км*². Нас. 369 тыс. чал. (1969). Падзяляецца на 3 вобласці. Адм. ц., галоўны порт і адзіны горад Занзібар (60 тыс. ж., 1967). Пераважаюць афрыканцы з групы ўсх. банту (гавораць на мове суахілі). Жывуць таксама арабы, індыйцы, пакістанцы. Амаль усе веруючыя — мусульмане.

А-вы нізінныя (да 119 м), складзеныя з вапнякоў (распаўсюджаны карст), абкружаныя каралавымі рыфамі. Клімат субэкватарыяльны. Т-ра паветра 28 у студз., 23 °С у ліп. Ападкаў 1500—2000 *мм* за год з максімумам у крас.— маі і ў ліст.— снеж. Рэк няма. Невялікія ўчасткі трапічных лясоў, хмызнякі, пераважае культурная расліннасць. Шмат птушак і насякомых. Прыбярэжныя воды багатыя на рыбу.

Гал. роля ў эканоміцы належыць земляробству. Нацыяналізаваны прамысл., партовая гасп., электрастанцыі. Ёсць дзяржаўныя гасп. і сялянскія кааператывы. Гал. с.-г. культура — гваздзіковае дрэва. А-вы даюць каля 80% сусв. вытворчасці гваздзікі. Другая па значэнні культура — какосавая пальма. Вырошчваюць таксама рыс, бататы, цытрусавыя, ананасы, бананы, манга, агародніну. Гадуюць буйн. раг. жывёлу. Рыбалоўства. Невялікія прадпрыемствы па вытворчасці гваздзіковага і какосавага алею, мыла, фруктовых сокаў. Саматужнае ганчарства. Ва ўнутр. зносінах пераважае прыбярэжнае суднаходства і аўтатранспарт. Экспартуюць гваздзіку і гваздзіковы алей (каля 75% экспарту), копру, какосавы алей. Імпарт: харч. прадукты, тканіны, нафтапрадукты, машыны і абсталяванне. Пра гісторыю гл. ў арт. *Аб'яднаная Рэспубліка Танзанія.*

ЗА́НІ, вёска ў Старагабскім с/с Мядзельскага р-на Мінскай вобл., каля воз. Дэлгілі (2 *км*). Цэнтр калгаса «Шлях Ільіча». За 10 *км* на У ад Мядзела, 173 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Княгініна. 94 ж., двароў 36 (1971). Клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, магазін. Помнік 64 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗА́НКІ, вёска ў Свіслацкім с/с і раёне Гродзенскай вобл., каля р. Свіслач (1 *км*). Цэнтр калгаса «Савецкая Беларусь». За 3 *км* на ПдУ ад Свіслачы, 88 *км* ад Гродна, 5 *км* ад чыг. ст. Свіслач, каля шашы Свіслач — Поразава (1 *км*). 470 ж., двароў 98 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 14 землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАНКО́ВІЧ Валянцін Паўлавіч (н. 5.6.1937, Мінск), беларускі савецкі архітэктар. У 1959 скончыў Бел. політэхн. ін-т. З 1960 працуе ў Мінскпраекце. Гал. работы ў галіне ману-

ментальнага мастацтва. Удзельнік стварэння мемарыяльных комплексаў «Хатынь» (1969; Ленінская прэмія 1970), «Брэсцкая крэпасць-герой» (1971), праектаў помнікаў героям Вял. Айч. вайны капітану М. Гастэлу і яго экіпажу ў Радашковічах (1964), разведчыцы Ф. Конанавай у Любані (1967), падпольшчыкам Асіпторфу (1967). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1967.

ЗАНУДЗІН Юрый Фёдаравіч (н. 25.5.1923, в. Іванаўка Сяміпалацінскага пав.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з чэрв. 1941. Вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобл. 23—24.6.1944 стралковая рота пад камандаваннем З. адбіла танкавую атаку праціўніка, разграміла варожы гарнізон у в. Жовань, фарсіравала р. Басю. Акружаная ворагам рота 14 гадзін адбівала контратакі праціўніка. Служыць у Сав. Арміі.

ЗАНЬКАВЕ́ЦКАЯ (сапр. Адасоўская) Марыя Канстанцінаўна [22.7(3.8).1860, с. Занькі Нежынскага пав. Чарнігаўскай губ.— 4.10.1934], украінская актрыса. Адна з заснавальніц прафес. ўкр. т-ра. Нар. арт. УССР (1922). Творчую дзейнасць пачала ў трупе М. Крапіўніцкага ў «Наталцы Палтаўцы» І. Катлярэўскага. Выступала ў нар. трупах М. Садоўскага, М. Старыцкага, П. Саксаганскага, І. Карпенкі-Карага, І. Мар'яненкі. Рэаліст. мастацтва З. звязана з рэвалюц.-дэмакр. кірункам дарэвалюц. рус. і ўкр. т-ра. Стварыла вобразы абяздоленых укр. жанчын — Алены, Аксаны, Прыські («Міраед, ці Павук», «Пакуль сонца ўзыдзе, раса вочы выесць», «Па рэвізіі» Крапіўніцкага), Харыціны («Наймічка» Карпенкі-Карага), Наталлі («Лымірыўна» П. Мірнага), Азы, Цвіркункі («Цыганка Аза», «Чарнаморцы» Старыцкага).



Літ.: Дурилін С. М. Марія Заньковецька, Київ, 1955.

ЗАНЬКО́ Фёдар Пятровіч (н. 22.9.1921, в. Занькі Лепельскага пав. Віцебскай губ.), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1940. Скончыў школу паветр. стралкоў (1943). У Айч. вайну ўдзельнічаў у баях пад Сталінградам. Вызначыўся пры вызваленні Крыма, Беларусі, Прыбалтыкі, у баях ва Усх. Прусіі. Зрабіў 234 баявыя вылеты, збіў 3 самалёты. Жыве на радзіме.

ЗАПАВЕ́ДНІК, спецыяльна выдзеленая тэрыторыя, якая мае навуковую і культ.-асветную каштоўнасць як тыповае або рэдкае ландшафтнае ўтварэнне. Тэрыторыя З. з усімі аб'ектамі прыроды на ёй з'яўляецца дзярж. запаведным фондам, выключаецца з гасп. абароту на нявэўны перыяд і ахоўваецца законам. Асн. задачы З. у СССР: вывучэнне прыродных працэсаў, што адбываюцца ў прыродных комплексах; выяўленне метадаў іх паляпшэння і найб. рацыянальнага выкарыстання; удзел у распрацоўцы пытанняў рэканструкцыі флоры і фаўны Сав. Саюза.

У СССР З. пачалі ствараць у першыя гады Сав. улады. У 1919 паводле праекта, ухваленага У. І. Леніным, арганізаваны Астраханскі З.; у 1920 Леніным падпісаў дэкрэт СНК РСФСР аб стварэнні на Паўд. Урале Ільменскага З. У СССР (на пач. 1971) 89 запаведнікаў і 2 дзярж. запаведна-паляўнічыя гасп. (агульнай пл. каля 7,4 млн. га). Найб. вядомыя З.: Каўказскі, Крымскі, Чарнаморскі, Асканія-Нова, Варонежскі, Пячора-Ілычскі, Баргузінскі, Сахатэ-Алінскі, Дарвінскі, Оксскі, Прыокска-тэрасны і інш. На Беларусі: *Белавежская пушча, Бярэзінскі дзяржаўны запаведнік, Прыпяцкі дзяржаўны ландшафтна-гідралагічны запаведнік.* Вял. значэнне З. у зберажэнні каштоўных жывёл (зубра, плыскістага аленя, рачнога бабра, собаля, куніцы, ласкі, сайгака, марскога коціка, хахулі, гагі, дрофы, пелікана, фламінга, белай чаплі) і раслін (самшыта, аксамітнага дрэва, лотаса і інш.). З. з'яўляюцца крыніцай рассялення дзікіх жывёл, садзейнічаюць зверагадоўлі, увядзенню ў гасп. абарот нарысных чалавеку раслін, прапагандуюць навуковы. У замежных краінах З. трох тыпаў: агульныя, частковыя і нац. паркі (гал. мэта апошніх — прапаганда аховы прыроды). Вядомыя нац. паркі: Пелаўстонскі, Іасеміцкі (ЗША), Гран-Парадыза (Італія), Лейк-Дыстрыкт (Вялікабрытанія).

Літ.: Заповедники Советского Союза, М., 1969; Заповедники СССР, т. 1—2, М., 1951; Охрана природы. Природные ресурсы Белоруссии и их рациональное использование, М., 1969.

І. І. Майсеенка. Мінск.

«ЗАПАВЕ́ТНЫЯ ГАДЫ», гады, на працягу якіх у некат. раёнах Русі забараняўся пераход сялян ад аднаго феадала да другога ў *Юр'еў дзень*; найважн. момант у заканадаўчым афармленні *прыгоннага права* ў Расіі.

Уведзены ўрадам Івана IV з 1581, на пачатку ўсеагульнага перапісу земляў для падвядзення вынікаў гасп. заняпаду ў 70—80-я г. 16 ст. «З. г.» адмянялі артыкулы Судзебнікаў 1497 і 1550 пра свабоднае *выхад сялянскі*. У агульнадзярж. маштабе «З. г.» ўведзены ўказам Фёдара Іванавіча ад 1592—93, які абвясціў пісцовыя кнігі 80—90-х г. юрыд. асновай сялянскага прыгону.

Літ.: Греков Б. Д. Крестьяне на Руси, с древнейших времен до XVII века, кн. 2, 2 изд., М., 1954; Корецкий В. И. Из истории закрепощения крестьян в России в конце XVI—начале XVII в. (К проблеме «заповедных лет» и отмены Юрьева дня), «История СССР», 1957, № 1.

ЗАПАВО́ЛЬВАННЕ НЕЙТРО́НАЎ (у ядзернай тэхніцы), памяншэнне кінетычнай энергіі нейтронаў у выніку пасідоўных сутыкненняў з атамнымі ядрамі рэчыва (запавольніка). Запавольнікам служыць графіт, звычайная і *цяжкая вада*, вокіс берылію. З. н.— асн. спосаб атрымання павольных (цеплавых) нейтронаў, з дапамогай якіх адбываюцца кіроўныя ланцуговыя ядзерныя рэакцыі. Гл. таксама *Атамны рэактар, Ядзерная тэхніка.*

ЗАПАДЗІНЫ (сподкі), круглаватыя ўпадзіны ад некалькіх да сотняў метраў у дыяметры і ад 2 да 5, зрэдку да 10 *м* глыбінёй.

Утвараюцца на водападзелах або ў старажытных тэрасах пад уплывам глебаўтварэння і вышчалачвання карбанатаў з парод, якія залягаюць ніжэй. Днішчы З. увільготненыя, укрытыя расліннасцю або запоўненыя азёрамі. У СССР размешчаны на раўнінах у паўпустыннай, стэпавай, лесастэпавай і лясной зонах, у Беларусі на ўзвышшах раўнін (Аршанска-Магілёўскай, Цэнтральнабярэзінскай) і на марэнных узвышшах (Мінскім, Навагрудскім і інш.).

Літ.: Дементьев В. А. Современные геоморфологические процессы на территории Белоруссии, в сб.: Труды географического ф-та БГУ им. Ленина, в. 2, Мн., 1958.

«ЗАПА́ДНАЯ КО́ММУНА», газета, афіцыйны орган выканкома Саветаў *Заходняй вобласці* (Заходняй Камуны). Выходзіла ў Смаленску на рус. мове з ліст. 1918 да студз. 1919.

З 24.11(7.12).1917 наз. «Известия Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов», з канца крас. 1918 — «Известия исполнительного комитета Советов Западной области и Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов», з вер. 1918 — «Известия исполнительного комитета Советов рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Западной Коммуны», з кастр. 1918 — «Известия исполнительных комитетов Советов рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Западной Коммуны и города Смоленска», з № 262 ад ліст. 1918 — «Западная Коммуна».

Газета змяшчала афіц. матэрыялы Сав. ўрада, Зах. Камуны, паведамленні пра падзеі на франтах грамадз. вайны, пра становішча на акупаванай ворагам тэрыторыі Беларусі, пісала пра гасп. і культ. жыццё Зах. вобласці, заклікала да барацьбы з контррэвалюцыяй, інтэрвенцыяй, змагалася за ўстанаўленне Сав. улады ў Зах. вобласці. У апошніх нумарах «З. К.» змешчаны матэрыялы 6-й Паўн.-Зах. абл. канферэнцыі РКП(б), якая абвясціла стварэнне Беларускай Сав. Сацыялісц. Рэспублікі. Апошні нумар газеты пад назвай «З. К.» выйшаў 3.1.1919.

ЗАПАЗЫЧА́ННІ Ў МО́ВЕ, моўныя сродкі, што з'явіліся з іншых моў як вынік дзярж., гаспадарчых і культ. зносін паміж народамі. Узбагачаюць і папаўняюць слоўнікавы склад. Могуць быць вусныя і пісьмовыя, непасрэдна з мовы-крыніцы ці праз суседнія мовы. Запазычваюцца словы, іх часткі (карані, прыстаўкі, суфіксы), выслоўі, грамат. формы і нават гукі.

З агульнаслав. эпохі ў бел. мове, як і ў іншых славянскіх, асталіся нешматлікія германізмы, балтызмы, іранізмы, цюркізмы. Значна больш запазычанняў прыпадае на эпоху самаст. гісторыі бел. мовы: паланізмы («праца», «хлопец»), германізмы («ліхтар», «цыбуля»), лацінізмы («аркуш», «колер»), цюркізмы («аршын», «барыш») і літуанізмы («дойлід», «ёўня»). Бел. мова ўзбагацілася многімі рус. словамі («ісціна», «подзвіг», «саюз»), а бел. лексіку знаходзім у іншых мовах, напр., укр. («бадьорий» — «бадзёры», «калач» — «калач»), польскай (hodowla — «гадоўля», krynica — «крыніца») і літоўскай (kroupa — «крупы», rūda — «руда»). Новыя запазычанні ў мове — *інтэрнацыянальная лексіка.* Даўнія цалкам падпарадкаваліся законам бел. мовы, некат. найноўшыя яшчэ захоўваюць фанет. і грамат. асаблівасці мовы-крыніцы. Сярод З. у м. вылучаюцца варварызмы — інтэрмоўныя словы ці выразы, якія не асвоены мовай і парушаюць не літ. нормы. *А. І. Журайскі.* Мінск.

ЗАПАЛЕ́ННЕ, прыстасавальна-ахоўная рэакцыя жывога арганізма на ўздзеянне хваробных фактараў. Бывае ад экзагенных (інфекцыі, траўмы, апёкі, абмаражэнні, апрамяненні, хім. рэчывы) і эндагенных (інфаркты розных органаў) прычын. Адрозніваюць З. вострае і хранічнае. Прыкметы З. падзяляюць на агульныя (павышаецца т-ра цела, паскараецца пульс, зменьваецца састаў крыві, слабасць) і мясцовыя (пачырванение, прыпухласць, павышэнне т-ры, боль, парушэнне функцыі хворага органа).

З. характарызуюць тры кампаненты: дыстрафія — парушаецца жыўленне тканак; эксудацыя — расстройваецца кровазварот з выхадам вадкай часткі крыві і лейкацытаў з крывяносных сасудаў; праліферацыя — размнажаюцца клетачныя элементы. Ад перавагі аднаго з кампанентаў З. бывае альтэратыўнае, эксудатыўнае і праліфератыўнае. І. І. Мечнікаў паказаў значэнне ў З. працэсу паглынання і ператраўлення хваробных агентаў лейкацытамі *(фагацытоз)*. Значная роля ў развіцці З. належыць нервовай і эндакрыннай сістэмам. З.— аснова многіх хвароб *(запаленне лёгкіх, апендыцыту)*. З. туберкулёзнае, сіфілітычнае, ганакокавае наз. спецыфічным. Лячэнне: антыбіётыкі, сульфаніламіды, спецыфічныя сываваткі, хірург. аперацыі, дыэта, медыкаменты, якія памяншаюць боль, павышаюць імунабіял. актыўнасць і інш.

Літ.: Мечников И. И. Академическое собрание сочинений, т. 5, М., 1954; Давыдовский И. В. Общая патология человека, 2 изд., М., 1969; Поликар А. Воспалительные реакции и их динамика. Биология, патология и фармакодинамика, [пер. з франц.], Новосибирск, 1969.

Ф. М. Жмудзікаў. Мінск.

ЗАПАЛЁННЕ ЛЁГКІХ (пнеўманія), вострыя і хранічныя запаленні бронхаў, альвеалярнай або прамежкавай злучальных тканак лёгкіх. Спрыяюць З. л. пераахаладжэнні, катары верхніх дыхальных шляхоў, хваробы зубоў і інш.

Найчасцей бывае тры формы вострага З. л.: крупознае, ачаговае і віруснае. Крупознае (долевае, фібрознае, плеўрапнеўманія) — запаленне часткі лёгкіх і плеўры з фіброзным выпатам у лёгачныя альвеолы. Пачынаецца рантоўна, т-ра да 39—40 °С, моцны боль у баку, кашаль з макротай іржавага колеру (ад дамешку крыві). Ачаговае З. л. (бронхапнеўманія) — запаленне асобных участкаў лёгкіх без выпату. Пачынаецца паступова, слабы кашаль, макрота без крыві, т-ра да 38 °С. У дзяцей і старых бывае атыповае ачаговае З. л. (без т-ры і вонкавых прыкмет); удакладняюць яго рэнтгеналагічна. Віруснае З. л.— запаленне прамежкавай злучальнай тканкі (на 1—7-ы дзень пры грыпе), хварэюць доўга. Ускладненні З. л.: плеўрыты, абсцэсы, калапс, хранічнае З. л. Лячэнне: шпіталізацыя, антыбіётыкі і сульфаніламіды, сардэчныя сродкі, банькі, фізіятэрапія, лячэбная фізкультура. Прафілактыка: ліквідацыя ачаговых інфекцый, засцярога ад пераахаладжэння і ад пераходу хваробы ў хранічныя формы.

Літ.: Молчанов Н. С. Острые пневмонии, Л., 1965 (бібліягр.); Материалы IV респ. съезда терапевтов БССР, Мн., 1969.

А. С. Чыж. Мінск.

ЗАПА́ЛКАВАЯ ВЫТВО́РЧАСЦЬ, галіна дрэваапрацоўчай вытворчасці, якая вырабляе запалкі.

Выраб запалак пачаўся ў многіх краінах свету ў 30-я г. 19 ст. Першая запалкавая ф-ка ў Расіі пабудавана ў Пецярбурзе (1837). На Беларусі вырабляць запалкі пачалі ў 2-й пал. 19 ст. У 1880 было 14 невялікіх паўсаматужных фабрык. Пасля Кастр. рэв. запалкі выраблялі ў Барысаве, Гомелі, Рэчыцы і Пінску. У Вял. Айч. вайну ф-кі разбураны. Пасля вайны працуюць: *Барысаўскі фанеразапалкавы камбінат*, ф-кі ў Гомелі і Пінску. Выпуск запалак у БССР каля 3 млн. скрынак (па 1 тыс. карабкоў у кожнай) за год (1970). Запалкі бываюць бытавыя і спецыяльныя. Першыя падзяляюцца на бяспечныя (загараюцца ад спец. намазкі), сесквісульфідныя (загараюцца ад любой паверхні), вільгацеўстойлівыя (для мясцін з гарачым вільготным кліматам). Спец. запалкі: паляўнічыя, ветравыя і інш. Асн. сыравіна для запалак — драўніна асіны і ліпы. Матэрыялы, якія ідуць на галоўкі запалак (запальная маса): берталетава соль 53%, шкло молатае 13,3, клей касцявы 12, сурык жалезны 7, сера 5,5, бялілы цынкавыя 6, піралюзіт 1,5, хромпік каліевы 1,4, гумітрагант 0,3%. Матэрыялы для намазкі карабка (фосфарная маса): фосфар чырвоны 42%, антымоній 30, дэкстрын 5, піралюзіт 2, шкло молатае 2, мел 3%. З. в.— адна з найбольш меха-

нізаваных і аўтаматызаваных у дрэваапр. прамысловасці.

Літ.: Быстров Г. П. Технология спичечного производства, М.— Л., 1961.

Ч. І. Пухальскі. Барысаў.

ЗАПАЛЬНЫЯ САСТАВЫ, хімічныя злучэнні ці іх сумесі, якія пры гарэнні развіваюць высокую тэмпературу.

Адрозніваюць 2 групы З. с.: 1) з акісляльнікамі — *тэрміты* (т-ра гарэння каля 2500 °С) і тэрмітна-запальныя рэчывы; солі, што маюць у сабе кісларод (KClO$_4$ і інш.); 2) без акісляльнікаў (згараюць за кошт кіслароду паветра) — вадкія нафтапрадукты (бензін, газа) ці атрыманыя з іх і розных дамешак паўцвёрдыя студзяністыя З. с. (напр., *напалм*, т-ра гарэння каля 900 °С); магніевы сплаў «электрон» (каля 2000 °С); белы фосфар (каля 1300 °С) і яго растворы ў серавугляродзе. Найб. пашыраны З. с. ў ваеннай справе: імі начыняюць авіябомбы, артыл. снарады і інш. Гл. таксама *Піратэхніка*.

Літ.: Шидловский А. А. Основы пиротехники, 3 изд., М., 1964; Демидов П. Г. Основы горения веществ, М., 1951; Горлов А. П. Зажигательные средства, их применение и борьба с ними, 2 изд., М.— Л., 1943.

ЗАПАМІНАЛЬНЫ БЛОК вылічальнай машыны (ЗБ), *збіральнік*, частка вылічальнай машыны ці самастойны блок, у якім запісваюцца, захоўваюцца і выдаюцца зыходныя дадзеныя задачы, прамежкавыя вынікі вылічэння, пастаянныя велічыні, значэнні табліч ных функцый, каманды праграмы, канчатковыя вынікі задачы.

Існуюць ЗБ: электрычныя, магн., мех., цеплавыя, акустычныя, аптычныя, ядзерныя і інш. Найб. пашыраны ЗБ, пабудаваныя на прынцыпах: а) мех. выдалення ці перамяшчэння часткі матэрыялу прабіўкаю (перфакарткі і перфастужкі); б) змены магн. уласцівасцей матэрыялаў (магн. стужкі, барабаны, дыскі, ферытавыя стрыжні); в) збірання электрастатычных зарадаў у дыэлектрыках (кандэнсатарныя ЗБ, збіральныя электронна-прамяневыя трубкі, сегнетаэлектрыкі); г) выкарыстання ультрагукавых ці эл.-магн. ваганняў (ртутныя, кварцавыя, магнітастрыкцыйныя і эл.-магн. лініі затрымкі і інш.). У склад ЗБ уваходзяць: збіральны блок, дзе непасрэдна захоўваюцца дадзеныя ў асобных ячэйках памяці; рэгістр ліку — кароткачасовае (не больш аднаго такта) захоўванне кода ліку, які паступае з машыны ў ЗБ; блок запісу — пераўтварае код ліку ў сігналы, якія дзейнічаюць на збіральнае асяроддзе, запісваючы ці аднаўляючы інфармацыю; блок счытвання — счытвае інфармацыю з збіральнага блока, пераўтварае змену параметраў збіральнага асяроддзя ў сігналы, з якімі працуе машына; блок выбаркі ліку — вызначае ячэйкі памяці па зададзеным адрасе, выдае кіравальныя сігналы для работы блокаў запісу і счытвання; рэгістр адрасу — прымае і захоўвае адрас ячэйкі ЗБ; блок мясцовага кіравання — кіруе выкананнем аперацый, якія задаюцца *кіравальным блокам* машыны. У электроннай вылічальнай машыне (ЭВМ) ёсць некалькі ЗБ: аператыўны (унутраны) ЗБ для непасрэднай работы з *арыфметычным блокам* і запамінання дадзеных; ЗБ вонкавы для доўгага захоўвання вялікай колькасці дадзеных; доўгачасовы (пастаянны) ЗБ для захоўвання велічынь, якія не мяняюцца ў працэсе вылічэння; ЗБ буферны для ўзгаднення скорасцей работы асобных прыстасаванняў машыны, а таксама вонкавых аб'ектаў паміж сабой і з ЭВМ (гл. *Лічбавая вылічальная машына*). Асн. паказчыкі ЗБ: ёмістасць — колькасць інфармацыі, якая можа адначасова захоўвацца ў ЗБ; хуткадзеянне — характарызуецца часам звароту да ЗБ, неабходным, каб запісаць і прачытаць дадзеныя; надзейнасць работы — вызначаецца ўстойлівасцю, неадчувальнасцю да змены т-ры знадворнага асяроддзя, адсутнасцю ўзаемнага ўплыву на захаванасць інфармацыі ў суседніх ячэйках; эканамічнасць — характарызуецца адносінамі затрат на электроннае абсталяванне да ёмістасці ЗБ. Напр., ёмістасць аператыўнай памяці ЗБ машыны «Мінск-22» — 8192 машынныя словы, «Мінск-32» — 65 536 машынных слоў; хуткадзеянне (адпаведна) — 24 *мксек* і 5 *мксек* (гл. *Вылічальная машына «Мінск»*).

Літ.: Китович В. В. Оперативные запоминающие устройства на ферритовых сердечниках и тонких магнитных пленках, М.— Л., 1965; Оперативные и постоянные запоминающие устройства, М.— Л., 1965; Крайзмер Л. П. Быстродействующие ферромагнитные запоминающие устройства, М.— Л., 1964. *В. У. Варатынскі, У. А. Казушчык.* Мінск.

ЗАПАРО́ЖЖА (да 1921 Аляксандраўск), горад, цэнтр Запарожскай вобл. УССР, на абодвух берагах Дняпра. Рачны порт, чыг. вузел. 658 тыс. ж. (1970). Прамысловасць металургічная, маш.-буд., энергетычная. 120 прамысл. прадпрыемстваў. З-ды: «Запарожсталь», «Днепраспецсталь», ферасплаваў, коксахімічны, алюмініевы, электродны, трансфарматарны, аўтамабільны, электраапаратны, маторабудаўнічы, метызны, вогнетрывалых матэрыялаў, цагляна-чарапічны, шлакавай пемзы і сцянных блокаў, «Крэмніййпалімер». Камбінаты: абразіўных матэрыялаў, тытана-магніевы, домабудаўнічы. Прадпрыемствы лёгкай, харч. прамысловасці. Маш.-буд., пед., мед. ін-ты, вячэрняе аддз. Днепрапятроўскага інжынерна-буд. ін-та, філіялы Днепрапятроўскага металург. ін-та і Данецкага ін-та сав. гандлю; 13 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Муз.-драм., лялечны тэатры, філармонія. Краязнаўчы музей.

Засн. ў 1770 як крэпасць для абароны паўд.-зах. Украіны ад набегаў крымскіх татар і туркаў. З 1806 цэнтр павета. Эканам. развіццю горада спрыяў буд-ва чыгункі Масква — Сімферопаль (70-я г. 19 ст.) і Данбас — Крывы Рог (пач. 20 ст.). У 1922 у З. створаны к-т РСДРП, пад кіраўніцтвам якога ў снеж. 1905 адбылося ўзбр. паўстанне. Сав. ўлада ўстаноўлена 2(15).1.1918. У 1927—32 каля З. пабудаваны Днепрагэс імя Леніна. Ням.-фаш. захопнікі акупавалі (1941—43) і разбурылі горад. Пасля вайны адноўлены.

ЗАПАРО́ЖСКАЯ ВО́БЛАСЦЬ, на ПдУ Украінскай ССР. Утворана 10.1.1939. Пл. 27,2 тыс. км². Нас. 1775 тыс. чал. (1970). Падзяляецца на 18 раёнаў; 13 гарадоў, 20 гар. пас. Цэнтр г. Запарожжа.

Паверхня — плоская нізіна, якая паніжаецца з Пн на Пд і да Азоўскага м. абрываецца уступам 18—25 м. Уздоўж берага цягнецца вузкая пясчаная палоса пляжаў. На У Прыазоўскае ўзв. (выш. да 324 м), парэзанае далінамі рэк і лагчынамі. Карысныя выкапні: жал. і марганцавая руды, буры вугаль, газ, граніт, каалін, графіт. Мінер. крыніцы. Клімат умерана кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. −4; −5, ліп. 22; 24 °С. Ападкаў за год 350—400 мм на Пн, 300—350 мм на Пд. Вегет. перыяд каля 200 дзён. Гал. рака Дняпро з прытокам Конка; частка Кахоўскага вадасх. Рэкі Малочная, Аблоточная, Берда належаць да бас. Азоўскага м. Глебы чарназёмныя, цёмна-каштанавыя, каштанавыя і саланцы. З. в. ляжыць у стэпавай зоне, стэп амаль увесь разараны, лясы асталіся ў абалонах рэк.

Асн. насельніцтва ўкраінцы (68,2%), жыццё рускія і інш. Сярэдняя шчыльн. 65,2 чал. на 1 км². Гарадскога нас. 66% (1970). Найб. гарады: Запарожжа, Мелітопаль, Бярдзянск, Такмак.


Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці павялічылася ў 1970 у параўнанні з 1940 у 10 разоў. Гал. галіны прамысловасці: металург., маш.-буд., энергетычная, хімічная. Найб. з-ды: «Запарожсталь», «Днепраспецсталь», ферасплаваў, вогнетрывалых матэрыялаў, Дняпроўскі алюмініевы, трансфарматарны, электраапаратны, аўтамабільны, маторабудаўнічы, метызны, электродны, а таксама абразіўных матэрыялаў і тытана-магніевы камбінаты (Запарожжа), «Азоўкабель», Запарожжа — Бярдзянск. Суднаходства па Дняпры і Азоўскім м. Аўтамаб. дарог 7600 км, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 3200 км. 6 ВНУ, 25 сярэдніх спец. навуч. устаноў. Муз.-драм. і лялечны тэатры, філармонія. 4 музеі. Абл. газ. «Запорізька правда» і «Индустриальное Запорожье».

Літ.: Історія міст і сіл Української РСР. Запорізька область, Київ, 1970.

Я. І. Сцяцэнка. Кіеў.

ЗАПАРО́ЖСКАЯ СЕЧ, гл. *Сеч Запорожская.*

ЗАПАРО́ЖСКІ Іван Мікалаевіч [н. 22.6(5.7).1916, с. Серпакрылава Камышынскага пав. Саратаўскай губ.— 1949], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1941. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Бабруйскай аперацыі. 24.6.1944 гвардз. стралк. полк пад камандаваннем З. прарваў абарону праціўніка на Пд ад Парычаў, гэтым самым увесці ў наступленне танкавыя, механіз. і кав. злучэнні, якія закончылі акружэнне бабруйскай групоўкі ворага. Удзельнік вызвалення Слуцка.



ЗАПА́С АРМІІ І ФЛО́ТУ, людскія ваенна абучаныя кантынгенты краіны, прызначаныя для ўмацавання арміі і папаўнення страт у вайне. Уключае грамадзян, якія стаяць на ваенным уліку (ваеннаабавязаныя) і прыгодныя да службы ў ваенны час.

Салдаты, матросы, сяржанты і старшыны па абучанасці дзеляцца на 2 катэгорыі, а па ўзросце ўсе ваеннаслужачыя — па 3 разрады. Тэрмін знаходжання ў запасе ў СССР: салдатаў, матросаў, сяржантаў і старшын ва ўзросце да 50 гадоў (мужчын), да 40 (жанчын), афіцэраў і генералаў ад 50 да 65 гадоў у залежнасці ад звання, афіцэраў-жанчын да 50 гадоў. Для разгортвання войск і вядзення баявых дзеянняў ствараецца таксама запас матэрыяльных сродкаў.

ЗАПАСЫ КАРЫСНЫХ ВЫКАПНЯЎ, колькасць карысных выкапняў у адзінках масы ці аб'ёму, якая ёсць у нетрах на пэўнай плошчы. У залежнасці ад плошчы пашырэння вылучаюць З. к. в. басейнаў, раёнаў, радовішчаў, шахтавых палёў, участкаў, блокаў і інш. Падзяляюцца на балансавыя (прамысловыя), прыдатныя для выкарыстання ў нар. гасп. пры сучасным узроўні тэхнікі і эканомікі, і забалансавыя (непрамысловыя), якія могуць стаць прамысловымі пры распрацоўцы новых метадаў здабычы, абагачэння і пры змене эканам. умоў раёна. Паводле ступені разведанасці і вывучанасці З. к. в. класіфікуюцца на катэгорыі A, B, C_1 і C_2, якія вызначаюцца комплексам адзнак.

Запасы катэгорыі А прызначаюцца для вытв. планавання і праектавання здабычы; катэгорыі В — для абгрунтавання капіталаўкладанняў у

буд-ва горных прадпрыемстваў і для складання тэхн. праекта распрацоўкі радовішча; катэгорыі C_1 — для абгрунтавання перспектыўных планаў прамысловасці і для праектавання дэталёвай разведкі; катэгорыі C_2 — для абгрунтавання далейшых геолагаразведачных работ. Гл. таксама *Разведка геалагічная*.

Літ.: Крейтер В. М. Поиски и разведка месторождений полезных ископаемых, 2 изд., М., 1969; Подсчет запасов месторождений полезных ископаемых, М., 1960; Требования к содержанию и результатам геологоразведочных работ по этапам и стадиям, ч. 1—2, М., 1967. *М. Ф. Янюк.* Мінск.

ЗАПАТОЦКІ (Zápotocký) Антанін (19.12.1884, Закалані каля Кладна — 13.11.1957), дзеяч чэхаславацкага і міжнар. рабочага руху, дзярж. і паліт. дзеяч Чэхаславакіі, пісьменнік. Сын Л. Запатоцкага — аднаго з заснавальнікаў с.-д. партыі Чэхіі. Працаваў каменячосам (1898—1905). З 1902 чл. с.-д. партыі, з 1918 адзін з кіраўнікоў рэвалюц. крыла с.-д. партыі. Дэлегат II, IV, VI і VII кангрэсаў Камінтэрна. Сустракаўся (1920) з У. І. Леніным. Зрабіў значны ўклад у стварэнне *Камуністычнай партыі Чэхаславакіі* (КПЧ). Чл. яе ЦК і Палітбюро з дня заснавання (1921). У 1922—25 сакратар ЦК КПЧ (у 1922 ген. сакратар ЦК), у 1925—38 дэп. Нац. сходу ад КПЧ, у 1929—39 ген. сакратар Цэнтр. бюро прамысл. саюзаў (Чырв. прафсаюзаў). Змагаўся за адзінства рабочага класа і абарону краіны ад пагрозы фаш. агрэсіі. З акупацыяй Чэхаславакіі (1939) арыштаваны гітлераўцамі, сядзеў у турмах і канцлагерах, дзе ўдзельнічаў у падпольнай рабоце. Пасля вызвалення Чэхаславакіі Сав. Арміяй старшыня Аб'яднанага рэвалюц. прафс. руху краіны (1945—50), чл. Прэзідыума (з 1954 Палітбюро) ЦК КПЧ. Актыўны ўдзельнік разгрому контррэвалюц. змовы ў 1948 (гл. *Лютаўскія падзеі 1948*). З чэрв. 1948 старшыня Савета Міністраў, з сак. 1953 прэзідэнт Чэхаславанкай рэспублікі. Аўтар некалькіх раманаў пра рэвалюц. рух чэш. пралетарыяту: «Узнімуцца новыя байцы», 1949; «Бурны 1905 год», 1949; «Чырвонае зарава над Кладнам», 1951; «Світанне», 1956; шэрагу арт. пра рабочы рух.



Тв.: Рус. пер.— Избр. произв., т. 1—2, М., 1959.
Літ.: Spisovatelé Antoninu Zápotockému. [Sb.], Praha, 1958.

ЗАПАТЫЛЬВАННЕ, механічная апрацоўка задняй паверхні (запатылка) зубцоў рэзальнага інструменту па зададзенай крывой.

Робіцца, каб профіль зубца аставаўся пастаянным пры ператочках інструменту. Запатыльваюць пераважна фасонныя і дакладныя профільныя фрэзы, гайкарэзы. Крывыя З.— лагарыфмічная спіраль, архімедава спіраль і інш. Для З. выкарыстоўваюць *запатыльны станок*.

Літ.: Семенченко И. И., Матюшин В. М. и Сахаров Г. Н. Проектирование металлорежущих инструментов, М., 1963.

ЗАПАТЫЛЬНЫ СТАНОК, металарэзны станок для *запатыльвання* зубцоў рэзальнага інструменту.

Да З. с. адносяцца такарна-запатыльныя станкі, якія падзяляюцца на універсальныя і спецыяльныя, і шліфавальна-запатыльныя. Запатыльванне можна рабіць і на разьбашліфавальных станках. Пры запатыльванні, напр., на такарна-запатыльным станку інструмент, які запатыльваюць, верціцца вакол восі, а разец рухаецца аваротна-паступальна ў напрамку да паверхні запатыльвання.

Літ.: Кудряшов А. А. Станки инструментального производства, 2 изд., М., 1968; Палей М. М. Технология производства режущего инструмента, М., 1963. *С. І. Міткевіч.* Мінск.

ЗАПІС АКТАЎ ГРАМАДЗЯНСКАГА СТАНУ (ЗАГС), у СССР дзярж. орган, які рэгіструе нараджэнне, смерць чалавека, уступленне ў шлюб або скасаванне яго, усынаўленне, перамену прозвішча ці імя. Гл. таксама *Акты грамадзянскага стану*.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр Малотынскага с/с і калгаса «Спартак». За 22 *км* на ПнЗ ад Оршы, 62 км ад Віцебска, за 0,5 *км* ад чыг. ст. Смальяны. 71 ж., гасп. 25 (1971). Клуб, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Брацкая магіла 24 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Бялыніцкім р-не Магілёўскай вобл., на р. Ліпаўка. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Подзевічы». За 22 *км* на ПдЗ ад Бялыніч, 66 *км* ад Магілёва, 20 *км* ад чыг. ст. Друць. 375 ж., гасп. 110 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, швейная і шавецкая майстэрні, сталовая, 3 магазіны. Помнік на брацкай магіле 27 сав. воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Віцебскім р-не, на правым беразе р. Усвячы. Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны партызан». За 54 *км* на ПнУ ад Віцебска, на шашы г. п. Сураж — в. Усвяты (РСФСР), 12 *км* ад прыстані Сураж на Зах. Дзвіне. 229 ж., гасп. 78 (1971). Ляспіцтва, майстэрні камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 225 сав. воінаў, партызанаў, землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Карэліцкім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Новае жыццё». За 2 *км* на ПнУ ад Карэліч, 202 км ад Гродна, 48 *км* ад чыг. ст. Навагрудак. 507 ж.; дварoў 166 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, вет. ўчастак, аддз. сувязі, магазін. Магіла сакратара Карэліцкага падпольнага райкома КСМЗБ М. П. Арцюха, забітага польскімі акупантамі ў 1932. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 16 мірных жыхароў вёскі. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Ятранскім с/с Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Ятранка. Цэнтр калгаса «Заполле». За 28 *км* на Пд ад Навагрудка, 260 *км* ад Гродна, 10 *км* ад чыг. ст. Навагрудак, каля шашы г. п. Навагрудак — в. Валеўка (1 *км*). 616 ж., дварoў 298 (1971). Млын. Сярэдняя школа, клуб, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску, загубілі 20 мірных жыхароў.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на р. Дабрыца. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Кірава. За 11 *км* на ПнЗ ад Рагачова, 132 *км* ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з шашою Бабруйск — Рагачоў. 488 ж., дварoў 144 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. Помнікі на 2 брацкіх магілах 480 сав. воінаў, помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Бокшыцкім с/с Слуцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Дзяржынскага. За 7 *км* на Пн ад Слуцка, 98 *км* ад Мінска, 9 *км* ад чыг. ст. Слуцк, на шашы Мінск — Слуцк. 336 ж., гасп. 95 (1971). Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін.

ЗАПО́ЛЛЕ, вёска ў Смілавіцкім с/с Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Запаветы Ільіча». За 33 *км* на З ад Чэрвеня, 32 *км* ад Мінска, 25 *км* ад чыг. ст. Рудзенск, на шашы Мінск — Магілёў. 638 ж., гасп. 175 (1971). Лесапільня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАПО́ЛЬСКАЯ (Zapolska; сапр. Корвін-Пятроўская) Габрыэля (30.3.1857, в. Падгайцы Луцкага пав. Валынскай губ.— 17.12.1921), польская пісьменніца і актрыса. З сям'і памешчыка. Выступала на сцэнах Кракава, Познані, Львова, Варшавы, Парыжа. У 1883 і 1897 гастралявала ў Пецярбурзе. Аўтар раманаў «Каська-Карыятыда» (1885—86), «Чалавечы звярынец» (1893), «Перад пеклам» (1894), «Жанчына канца стагоддзя» (1897), «Сезоннае каханне» (1905), «Пра што не кажуць» (1909), «Пра што нават не хочацца думаць» (1914), драм «Малка Шварцэнконф» (паст. 1897), «Жабуся» (паст. 1897), «Іх чацвёра» (паст. 1907), «Панна Малічэўская» (паст. 1910) і інш. У рэаліст. творчасці З., адзначанай рысамі натуралізму, выкрываецца хлуслівая мараль тагачаснага грамадства, праўдзіва паказаны бяспраўе і пакуты беднаты. Найб. вядомая драма «Мараль пані Дульскай» (пастаўлена ў 1906, 1907) пастаўлена ў тэатры імя Я. Коласа (1956).

Тв.: Бел. пер.— Мараль пані Дульскай, «Полымя», 1958, № 10; рус. пер.— Мораль пани Дульской. Пьесы, рассказы, повести, М., 1965.
Літ.: Czachowska J. Gabriela Zapolska. Monografia bio-bibliograficzna, Kraków, 1966.

ЗАПРУДДЗЕ, вёска ў Залескім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Новы шлях». За 12 *км* на Пн ад Глыбокага, 212 *км* ад Віцебска, 15 *км* ад чыг. ст. Глыбокае. 180 ж., гасп. 66 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗАПРУДДЗЕ, вёска ў Комсеніцкім с/с Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Іскра». За 15 *км* на ПдУ ад Круглага, 50 *км* ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Талачын. 99 ж., дварoў 29 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАПРУДДЗЕ, вёска ў Гарывецкім с/с Сенненскага р-на Віцебскай вобл., на р. Крывінка, каля воз. Багданаўскае (1,5 *км*). Цэнтр калгаса «Верны шлях». За 9 *км* на ПнЗ ад Сянна, 109 *км* ад Віцебска, 26 *км* ад чыг. ст. Бурбін; аўтобусныя зносіны з Сяннom. 147 ж., гасп. 44 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ЗАПЯСО́ЧА, вёска ў Верасніцкім с/с Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл., каля р. Прыпяць (0,5 *км*). Цэнтр калгаса «Перамога». За 28 *км* на ПдЗ ад Жыткавіч, 266 *км* ад Гомеля. 1040 ж., дварoў 390 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1942 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску, загубілі 71 мірнага жыхара (паводле ўдакладненых звестак).

ЗАРА́, сукупнасць светлавых атмасферных з'яў, якія заключаюцца ў зменах колеру неба ў сувязі з узыходам і захадам Сонца. Абумоўлена складаным спалучэннем працэсаў паглынання, рассеяння, дыфракцыі і пераламлення сонечных прамянёў у атмасферы. Гл. таксама *Атмасферная оптыка*. Адпаведна гавораць пра ранішнюю і вячэрнюю З.

У ясны вечар пры захадзе Сонца чырванаватая ўніз, вышэй жоўтая палоса ўздоўж гарызонта і белаватае светлае зяянне над ёю змяняюцца потым пурпуровым святлом; адначасова на процілеглым баку неба падымаецца сінявата-шэры сегмент ценю Зямлі, над ім — усходняя З. са зменай колеру ад сіняга цераз зялёны і жоўты ў чырвоны, а яшчэ вышэй — яркі адбітак заходняга святла. Пры апусканні Сонца пад гарызонт на 2—3° пачынаюцца змрокавыя з'явы (гл. *Змрок*). Ранішняя З. развіваецца аналагічна, толькі ў адваротным парадку. Інтэнсіўнасць фарбаў З. залежыць ад колькасці пылу і вільгаці ў атмасферы.

ЗАРА́ КАМУНІ́ЗМА, вёска ў Жалудоцкім с/с Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Жалудзянка. Цэнтр калгаса «Зара камунізма». За 26 *км* на У ад Шчучына, 94 *км* ад Гродна, 12 *км* ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 209 ж., гасп. 64 (1971). Клуб, б-ка, магазін. Помнік аднавяскоўцам — воінам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАРАБО́ТНАЙ ПЛАТЫ СІСТЭ́МЫ, сукупнасць правілаў, якія вызначаюць суадносіны паміж мерай працы і памерам узнагароды за працу. З. п. с.: простая пачасовая, пачасова-прэміяльная, прамая здзельная, здзельна-прагрэсіўная, здзельна-прэміяльная, акордная, ускосна-здзельная.

Пры простай пачасовай сістэме заработная плата налічваецца па месячных, дзённых ці гадзінных тарыфных стаўках (акладах) у залежнасці ад колькасці адпрацаванага часу, кваліфікацыі, умоў і складанасці працы. Пры пачасова-прэміяльнай сістэме, акрамя заработку па тарыфнай стаўцы (акладзе), работніку дадаткова выплачваецца прэмія за паўпыя колькасныя або якасныя паказчыкі працы. Прамая здзельная сістэма гарантуе аплату працы па пазменнай расцэнцы за кожную адзінку выраблёнай прадукцыі. Пры здзельна-прагрэс. сістэме расцэнка за прадукцыю, выпушчаную звыш нормы, прагрэсіўна павялічваецца. Ужываецца на асобных, найб. важных і адказных участках вытворчасці. Здзельна-прэміяльная сістэма прадугледжвае, акрамя заработку па здзельных расцэнках, выплату прэмій за паўпыя колькасныя і якасныя паказчыкі. Ускосна-здзельная сістэма характэрна тым, што праца рабочага аплачваецца не па яго выпрацоўцы, а па выніку працы здзельшчыка, якога абслугоўвае гэты рабочы, або па канчатковым выніку працы цэха, прадпрыемства. Ужываецца пераважна на дапаможных работах. Пры акордпай сістэме на ўвесь загадзя вызначаны аб'ём работ налічваецца агульная сума заработку,

а равлік робіцца пасля выканання ўсёй работы ў адпаведнасці з кваліфікацыяй і затрачаным часам рабочага; гэтая сістэма звычайна спалучаецца з прэміраваннем за датэрміновае і высакаякаснае выкананне работ. У залежнасці ад формы арганізацыі працы З. п. с. бываюць індывідуальныя і брыгадныя. Пры індывідуальнай сістэме заработак рабочага непасрэдна залежыць ад асабістага выніку працы. Пры брыгаднай сістэме сума аплаты налічваецца на ўсю брыгаду, а размеркаванне паміж членамі брыгады робіцца з улікам тарыфнага разраду кожнага рабочага і колькасцю адпрацаванага ім часу. Гл. таксама *Заработная плата* і л-ру пры арт. *Э. А. Лутохіна.* Мінск.

ЗАРАБО́ТНАЯ ПЛА́ТА, пры сацыялізме грашовая форма часткі неабходнага прадукту, якая размяркоўваецца паміж рабочымі і служачымі адпаведна колькасці і якасці затрачанай працы. Адрозніваюць намінальную (сума грошай работніка за яго працу за пэўны час) і рэальную З. п. (магчымасць работніка атрымаць пэўную колькасць тавараў і паслуг за сваю грашовую З. п.). Асн. формы З. п.— пачасовая і здзельная. Пры пачасовай форме аплата працы праводзіцца па месячных, дзённых ці гадзінных тарыфных стаўках (акладах) у адпаведнасці з колькасцю працы. Пры здзельнай форме праца аплачваецца па фактычнай выпрацоўцы прадукцыі па здзельных расцэнках. У аснове арганізацыі З. п. ляжыць прынцып сацыялізма «ад кожнага па яго здольнасці, кожнаму — па яго працы». Канстытуцыі СССР і саюзных рэспублік гарантуюць права на працу, на атрыманне работы з аплатай працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і якасцю, замацоўваюць роўнасць аплаты за роўную працу незалежна ад полу, узросту, нацыянальнасці і расы. Гэта забяспечвае матэрыяльную зацікаўленасць у выніках вытворчасці, стымулюе рост прадукцыйнасці працы, садзейнічае павышэнню кваліфікацыі работнікаў, умацаванню дысцыпліны працы. Сацыяліст. грамадства ставіць сваёй гал. мэтай пастаяннае павышэнне дабрабыту працоўных, рост іх З. п. У 1971—75 мінімальны памер З. п. рабочых і служачых у СССР намечана павысіць да 70 руб. у месяц. Прадугледжана павялічыць стаўкі і аклады работнікаў з сярэдняй аплатай, занятых у прамысловасці, на транспарце і ў інш. галінах матэрыяльнай вытворчасці; павысіць З. п. пастаўнікаў, урачоў і мед. персаналу, а таксама работнікаў інш. спецыяльнасцей. Сярэднюю месячную З. п. рабочых і служачых у 9-й пяцігодцы намечана давесці да 146—149 руб. Сістэматычны рост рэальнай З. п. дасягаецца таксама зніжэннем падаходнага падатку, цэн на тавары, павелічэннем выплат і льгот з грамадскіх фондаў спажывання. Гал. крыніца росту З. п.—павышэнне прадукцыйнасці працы. З. п. плануецца і рэгулюецца сацыяліст. дзяржавай. Гэта забяспечвае адпаведнасць паміж мерай працы і мерай узнагароды, улік асаблівасці працы ў залежнасці ад важнасці галіны нар. гасп., цяжкасці, кваліфікацыі, значнасці і г. д. Памеры З. п. рабочых і служачых вызначаюць з дапамогай *тарыфнай сістэмы, заработнай платы сістэм, нормы выпрацоўкі.* З. п. плануецца і рэгулюецца сацыяліст. дзяржавай. Палажэнне аб сацыяліст. дзярж. прадпрыемстве (1965) і гасп. рэформа значна пашырылі правы прадпрыемстваў у рэгуляванні З. п. Акрамя таго, гасп. рэформа павысіла ролю матэрыяльных стымулаў працы, замацавала матэрыяльную зацікаўленасць не толькі ў выніках індывідуальнай працы, але і ў агульных выніках работы прадпрыемства.

У капіталіст. краінах, дзе рабочая сіла з'яўляецца таварам, З. п.— ператвораная форма вартасці (цаны) рабочай сілы. На першы погляд З. п. выглядае як плата за працу і таму замаскіроўвае ад гал. ўласцівасць рабочай сілы як тавару: стварэнне прыбавачнай вартасці. Памеры З. п. складаюцца на аснове дзеяння законаў рынку: яны не могуць падняцца вышэй вартасці рабочай сілы, але рабочыя вымушаны пры беспрацоўі прадаваць сваю рабочую сілу ніжэй яе вартасці і згаджацца на ўмовы, выгадныя прадпрыемцам. У капіталіст. краінах рэальная З. п. сістэматычна зніжаецца ў суадносінах з ростам цэн на прадметы спажывання, павелічэннем падаткаў, кватэрнай платы і інш. Характэрна таксама замаскіраванае зніжэнне З. п., бо за ўмовах павышанай інтэнсіфікацыі працы ў рабочых павялічваюцца затраты для кампенсавання павышаных выдаткаў фіз. і інтэлектуальных сіл. Шырока ўжываецца дыскрымінацыя ў аплаце працы ў залежнасці ад расы, нацыянальнасці, полу, узросту і інш. З. п. негрыцянкі ў ЗША складае $^{1}/_{5}$ частку заработку белага мужчыны, у Вялікабрытаніі ў параўнанні з аплатай дарослых мужчын З. п. юнакоў ніжэйшая на 58%, дзяўчат на 68%. Працоўныя капіталіст. краін вядуць барацьбу з манополіямі супраць дыскрымінацыі ў аплаце працы, эксплуатацыі і зніжэння З. п. Каб утаіць сапраўдную сутнасць З. п. пры капіталізме, адцягнуць пралетарыят ад рэвалюц. барацьбы, бурж. эканамісты ствараюць і распаўсюджваюць ілжэнавук. тэорыі. Яны сцвярджаюць, нібы З. п. з'яўляецца ўзнагародай за працу рабочага, а прыбытак — узнагарода за «арганізатарскую» дзейнасць і рызыку капіталіста, таму рабочыя і прадпрыемцы ў працэсе вытворчасці знаходзяцца ў адносінах супрацоўніцтва, а не антаганізму. «Тэорыя замкнёнага круга цэн і заработнай платы» спрабуе абгрунтаваць непазбежнасць зніжэння З. п. і перакласці працоўных у дарэмнасці барацьбы з прадпрыемцамі, бо быццам бы павышэнне З. п. вядзе да росту цэн. Гл. таксама *Рэальныя даходы насельніцтва.*

Кр.: Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб працы, «Ведамасці Вярхоўнага Савета Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік», 1970, № 29, арт. 265.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, раздз. 4, 17—23, Мн., 1952; Ягож. Крытыка Гоцкай праграмы, Мн., 1968; Энгельс Ф. Справядлівая заработная плата за справедлівы рабочы дзень, Маркс К. і Энгельс Ф. Соч., т. 19; Маркс К. Наёмная праца і капітал, Маркс К. і Энгельс Ф. Выбраныя творы, т. 1, Мн., 1951; Ленін У. І. Чарговыя задачы Савецкай улады, Тв., т. 27 (Полн. собр. соч., т. 36); Ягож. Заработкі рабочых і прыбыткі капіталістаў у Расіі, Тв., т. 18 (там жа, т. 22); Матэрыялы XXIV з'езду КПСС, Мн., 1971; Косыгин А. А. и Маврин А. В. Руководителю предприятия о трудовом законодательстве, М., 1970; Якушкин Я. С., В. И. Ленин о социалистической организации заработной платы, Л., 1969; Труд и заработная плата в СССР, М., 1968; Купельский Л. Э. Зарплата, доходы, стимулирование, М., 1968; Грузинов В. П. Материальное стимулирование труда в странах социализма, М., 1963; Володин В. С. Заработная плата в условиях современного капитализма, М., 1967.

А. А. Краўчанка. Мінск.

ЗАРАД, пэўная колькасць выбуховага рэчыва, прызначаная на кідальнае, асколачнае і фугаснае дзеянне.

Баявыя З. робяць з бяздымнага пораху (гл. *Порах*), пры імгненным гарэнні якога снарад (міна, куля) выштурхоўваецца са ствала з пэўнай нач. скарасцю. Разрыўныя З.— выбуховае рэчыва ўгускорасцю. Разрыўныя З.— выбуховае рэчыва ўгускорасцю. Разрыўныя З.— выбуховае рэчыва ўгускор

Перадрукоўваў творы Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, К. Буйло. У раздзеле «Працы нашых чытачоў» змяшчаў вершы, апавяданні, апісанні родных вёсак, запісы народных казак. Рэд.-выдавец Л. Войцік (З. Верас).

Літ.: Войцікава Л. (Зоська Верас). [«Заранка»], «Полымя», 1968, № 4. *І. У. Саламевіч.* Мінск.

ЗАРАНКА Сяргей Канстанцінавіч [24.9(6.10).1818, в. Ляды Аршанскага пав. Магілёўскай губ.— 20.12.1870(1.1.1871)], рускі жывапісец і педагог. Сын прыгоннага. Вучань і наслядоўнік А. Венецыянава. З 1834 вучыўся ў Пецярбургскай АМ (у 1843 акадэмік, у 1850 праф.). Праф. Маск. вучылішча жывапісу, ваяння і дойлідства (1856—70). Напісаў партрэты (А. Венецыянава, 2-я пал. 30-х г.; В. Пятрова, 1849; Ф. Талстога, 1850; ротмістра П. Панамарова, 1855; групавы партрэт «Выгляд залы вучылішча правазнаўства з групамі настаўнікаў і выхаванцаў», 1841), інтэр'еры («Унутраны выгляд Марскога Нікольскага сабора», 1843; і інш.). Распрацаваў сістэму выкладання, пабудаваную пераважна на вывучэнні натуры, дакладнасці ў перадачы бачнага свету. Сярод вучняў — В. Пяроў, У. Макоўскі, В. Пукіраў. У Дзярж. маст. музеі БССР 3 работы мастака.



С. К. Заранка. Партрэт Ф. П. Талстога. 50-я г. 19 ст. Дзярж. маст. музей БССР.

Літ.: Смирнов Г. Сергей Константинович Заренко. 1818—1870, М., 1951. *Л. Н. Дробаў.* Мінск.

ЗАРАНОК Таццяна Піліпаўна [н. 12(25).12.1917, ст. Васілевічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ.], беларуская і руская савецкая актрыса. Нар. арт. БССР (1967). Скончыла драм. курсы ў Мінску (1931) і студыю пры т-ры БДТ-2 (1933, педагогі Е. Міровіч, М. Міцкевіч, А. Ільінскі). У 1931—51 у т-ры імя Я. Коласа, з 1951 у Брэсцкім т-ры імя ЛКСМБ. Выканаўца вострахарактарных і камедыйных, лірыка-драм. роляў. Спалучае праўдзівасць унутр. жыцця вобраза з яркай і выразнай формай. Ролі ў бел. п'есах: Люба («Алазанская даліна» К. Губарэвіча і І. Дорскага), Таццяна («Над Бярозай-ракой» П. Глебкі), Паўліна («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы), Ганна Чыхнюк («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка), Даша («Брэсцкая крэпасць» Губарэвіча). У класічным і сав. рэпертуары: Фаншэта («Жаніцьба Фігара» П. Бамаршэ), Марціна («Лекар паняволі» Мальера), Белацелава, Варвара («Жаніцьба Бальзаміна», «Навальніца» А. Астроўскага), Дуня («Любоў Яравая» К. Трапёва), роля Н. К. Крупскай («Фінал» П. Строгава, «Брэсцкі мір» К. Губарэвіча) і інш.






Т. П. Заранок у ролях Даши (злева) і Н. К. Крупскай («Фінал»).

Т. Дз. Арлова. Мінск.

ЗАРАСТАК (праталіЙ), полавае пакленне (гаметафіт) у вышэйшых спаравых раслін — папарацяпў, хвашчоў, дзеразы.

Невялікая расліна (да 5 см), мае форму цэласнай або рассечанай пласцінкі, ніці, клубеньчыка з рызоідамі на ніжняй паверхні. Развіваецца ў глебе або на яе паверхні са споры, якая ўтвараецца на бясполым пакаленні (спарафіце). Жыве нядоўга, акрамя З. дзеравы, які дажывае да 20 гадоў. На З. развіваюцца органы полавага размнажэння — антэрыды і архегоніі. Пасля апладнення на ім з зіготы вырастае бясполае пакаленне (спарафіт). Гл. таксама *Чаргаванне пакаленняў.*



Зарастак папараці: *1* — архегоніі; *2* — антэрыдыі; *3* — рызоіды.

Літ.: Блукет Н. А. и Емцев В. Т. Ботаника с основами физиологии растений и микробиологии, М., 1969.

ЗАРАЎНЯЕЎ Анатоль Іванавіч (н. 11.1.1922, в. Сюдумар Сернурскага р-на Марыйскай аўт. вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1944, лётчык-штурмавік. Удзельнік вызвалення Віцебска, Оршы, Мінска. Зрабіў 140 баявых вылетаў. Жыве ў Іжэўску.

ЗАРАЧАНКА, вёска ў Навумавіцкім с/с Гродзенскага р-на, на левым беразе Нёмана. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 8 *км* на ПнЗ ад Гродна. 390 ж., гасп. 116 (1971).

ЗАРАЧЧА, вёска ў Браслаўскім р-не Віцебскай вобл., на беразе воз. Рака. Цэнтр сельсавета. За 6 *км* на ПнЗ ад Браслава, 236 *км* ад Віцебска, 36 *км* ад чыг. ст. Друя, на шашы Паставы — Даўгаўпілс (Латв. ССР). 128 ж., двароў 33 (1971). Васьмігадовая школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі. Помнік на магілках 449 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАРДАРАН Аганес Мкртычавіч [н. 7(20).1.1918, г. Карс], армянскі савецкі жывапісец. Нар. мастак Арм. ССР (1963), чл.-кар. АМ СССР (1958). Скончыў Ерэванскае маст. вуч. (1937), вучыўся ў Ленінградскай АМ (1937—41). Працуе ў Ерэване. Аўтар тэматычных кампазіцый [«Пасля працы», 1945; «Перамога будаўнікоў Севангэса», 1947; «Нахачавіх» («Хачатур Абавян»), 1948; «Вясна», 1956; і інш.] і пейзажаў («Світанне над Арагацам», 1953; «Жоўтыя горы», 1966; «Арарат», 1967; і інш.). Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Літ.: Цырлин И. И. Оганес Мкртичевич Зардарян, М., 1960.

ЗАРНІЦА (Linaria), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. залознікавых. Вядома больш за 150 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі і Амерыцы. У СССР 70 відаў, на Беларусі 3.



Зарніца звычайная: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка; *3* — плады.

Сцябло выш. да 1 *м*. Лісце сідзячае ланцэтнае або лінейнае. Кветкі са шпоркаю, жоўтыя, філетавыя, сабраныя ў гронкі або мяцёлкі. Плод — каробачка. На Беларусі найб. вядомая — З. звычайная, лянок (L. vulgaris, пар. назвы: блашчынец, лясная льніца, чысцец, каровіна масла). Расце як пустазелле на палях, аблогах, каля дарог. Лекавая расліна.

З. мараканская, З. залаціста-пурпуровая і інш. вырошчваюцца як дэкаратыўныя.

Літ.: Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

ЗАРОДАК, 1) у жывёл і чалавека — эмбрыён, арганізм на першых стадыях развіцця (ад яйца да пачаткавага здольнасці самастойна жыць і перамяшчацца). Развіваецца з яйца і жывіцца назапашанымі ў ім пажыўнымі рэчывамі (у птушак) або за кошт матчынага арганізма (у млекакормячых жывёл і чалавека). 2) У раслін — зачатак папарацепадобных і насенных раслін, пачатковы этап іх развіцця — антагенезу.

Развіваецца з аплодненай яйцаклеткі — зіготы, выключаючы выпадкі партэногенезу, апагаміі, поліэмбрыяніі. У папарацепадобных пачынаецца з аплодненай клеткі архегонію і ператвараецца ў новую асобіну; у насенных раслін развіваецца ўнутры семяпочкі з аплодненай яйцаклеткі архегонію (у голанасенных) або зародкавага мяшка (у пакрытанасенных). Гл. таксама *Апладненне.*

ЗАРОДКАВЫ МЯШОК, унутраная частка семязавязі ў насенных раслін. У ім фарміруецца яйцаклетка, адбываецца апладненне і развіваецца зародак.

ЗАРОНАВА (Заронаўскае), возера ў бас. р. Шэвінкі, правага прытока Зах. Дзвіны, у Віцебскім р-не. Пл. 3,96 *км*². Даўж. 7,8 *км*, найб. шыр. 1,2 *км*, сярэдняя 0,5 *км*, найб. глыб. 12,7 *м*, сярэдняя 5,4 *м*. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы пераважна спадзістыя, выш. 6—15 *м*, парослыя лесам. Берагі ўкрыты хмызняком, паўн.-заходнія забалочаныя. Найбольш глыбакаводная ч. дна ўслана карычневым і аліўкавым ілам. Вадавбор (171 *км*²) спадзіста-хвалісты і дробнаўзгорысты. Залівы возера зарастаюць чаротам, трыснягом, гарлачыкам і рдзестам. З. праточнае: упадаюць пратока з воз. Княжно, 7 ручаёў; сцёк у р. Заронаўку. Водзяцца лешч, судак, плотка, шчупак, верхаводка, лінь, язь, гусцяра, акунь.

ЗАРОНАВА, вёска ў Віцебскім р-не, на беразе воз. Заронава. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Заронава». За 26 *км* на ПнЗ ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Старое Сяло, на шашы Віцебск — Полацк. 315 ж., гасп. 104 (1971). Швейная майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны. У 1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі вёску. Помнік на брацкай магіле 3192 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.


ЗАРОЎЦЫ, вёска ў Рыжкавіцкім с/с Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл., каля р. Серабранка (1 *км*). Цэнтр калгаса «Праўда». За 5 *км* на З ад Шклова, 45 *км* ад Магілёва. 614 ж., двароў 210 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. У 1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАРУБІНА, вёска ў Карабоўскім с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Мічурына. За 4 *км* на ПдЗ ад Глыбокага, 200 *км* ад Віцебска. 39 ж., двароў 13 (1971). Клуб, б-ка, магазін.

ЗАРУБІНЕЦКАЯ КУЛЬТУРА, археал. культура плямёнаў, якія жылі ў Сярэднім і Верхнім Падняпроўі.

Назву атрымала ад могільніка каля с. Зарубінцы на Кіеўшчыне, адкрытага В. В. Хвойкам у 1899. Даследавалі П. М. Трацякоў, Ю. У. Кухарэнка, Л. Д. Побаль, Я. У. Максімаў, Я. У. Махно, В. П. Пятроў і інш. Плямёны З. к. займалі тэр. сучасных Гомельскай, Магілёўскай, б. ч. Брэсцкай і Пд Мінскай абл., Пн Украіны, частку Смаленскай і Бранскай абл. Храналагічна З. к. падзяляецца на ранні этап (сярэдзіна 3 ст. да н. э.— пач. 2 ст. н. э.), якому характэрны гарадзішчы, паселішчы і бескурганныя могільнікі, і позні (2—5 ст. н. э.) з паселішчамі і бескурганнымі могільнікамі. Насельніцтва будавала наземныя жытлы слупавой канструкцыі прамавугольнай формы і паўзямлянкі, ужывала жал. паканачнікі коп'яў, клінападобныя сякеры (кельты), нажы, сярпы, ляпны і гліняцаваны посуд, бранзалеты, шкляныя пацеркі, розныя фібулы і інш., падтрымлівала сувязі з скіфска-сарматскімі і кельцкімі плямёнамі, гарадамі Паўн. Прычарнамор'я, з плямёнамі, якія жылі на тэр. Польшчы і Прыбалтыкі, пазней з плямёнамі

Кераміка зарубінецкай культуры (в. Чаплін Лоеўскага р-на. Інстытут гісторыі АН БССР).



чарняхоўскай культуры. Пахавальны абрад — трупаспаленне (вельмі рэдка трупапалажэнне), у магілах побач з перапаленымі касцямі трапляюцца нобылады працы, кераміка, упрыгожанні. У сацыяльна-гістар. развіцці плямёны З. к. знаходзіліся на стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу і складвання тэрытарыяльнай абшчыны, існавала патрыярхальнае рабства. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, вдабывала і апрацоўвала жалеза, выраблялa бронзавыя ўпрыгожанні. Большасць даследчыкаў называюць З. к. старажытнаславянскаю. Найб. важныя помнікі З. к. на тэр. Беларусі: *Чаплін, Мохаў* (Лоеўскі р-н), *Гарошкаў, Глыбаў, Калочын* (Рачыцкі р-н), *Вароніна, Сямурадцы* (Жыткавіцкі р-н), *Велямічы, Атвержычы* (Столінскі р-н), *Абідня, Тайманава* (Быхаўскі р-н), *Шчаткава* (Бабруйскі р-н).

Літ.: Памятники зарубинецкой культуры, М.—Л., 1959 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 70); Новые данные о зарубинецкой культуре в Поднепровье, Л., 1969 (там жа, № 160); Кухаренко Ю. В. Зарубинецкая культура, М., 1964; Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970. *Л. Д. Побаль.* Мінск.

ЗАРУБЫ, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл., на р. Расасенка. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Зарубы». За 15 *км* на ПдУ ад Дуброўна, 122 *км* ад Віцебска, 24 *км* ад чыг. ст. Асінаўка, на шашы Дуброўна — в. Баева. 380 ж., гасп. 115 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік на брацкай магіле 320 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны.

ЗАРУДАЎЕ, вёска ў Мастоўскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Савецкая Беларусь». За 12 *км* на Пд ад Мастоў, 72 *км* ад Гродна, 14 *км* ад чыг. ст. Масты. 586 ж., двароў 171 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну і ў гады калектывізацыі ад рук ворагаў Сав. улады.

ЗАРУЧЫНЫ (змовіны, запоіны), звычай атрымання згоды маладой на шлюб. Існаваў ва ўсх. славян да пач. 20 ст.

З. адбываліся адразу пасля сватаўства і папярэднічалі вяселлю. Спраўляліся ў доме бацькоў маладой з удзелам маладой, маладога, іх блізкіх сваякоў, суправаджаліся частаваннем, песнямі, танцамі. На З. дамаўляліся пра пасаг, час і парадак вяселля, пра колькасць на ім гасцей і г. д., маладая абдорвала сваякоў маладога. Пасля З. маладая лічылася засватанай і адмовіцца ад шлюбу не мела права.

ЗАРУЧЭЎЕ, вёска ў Бешанковіцкім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл., на правым беразе Зах. Дзвіны. Цэнтр калгаса імя Конанава. За 7 *км* на Пн ад Бешанковіч, 62 *км* ад Віцебска, 25 *км* ад чыг. ст. Шумілінa. 44 ж., гасп. 17 (1971). Вет. пункт, аддз. сувязі, магазін. Вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАРХІ Аляксандр Рыгоравіч [н. 5(18).2.1908, Пецярбург], рускі савецкі рэжысёр кіно і сцэнарыст. Нар. арт. СССР (1969), засл. дз. маст. БССР (1955). Чл. КПСС з 1948. Скончыў Ленінградскі тэхнікум экраннага маст. (1927). З 1929 на кінастудыі «Ленфільм» у садружнасці з І. Хейфіцам стварыў фільмы «Гарачыя дзянёчкі» (1935), «Дэпутат Балтыкі» (1936), «Член урада» (1940), «Яго імя Сухэ-Батар» (1942), дакумент. «Разгром Японіі» (1945). У 1950—55 працаваў па студыі «Беларусьфільм» (фільмы «Паўлінка», 1952; «Несцерка», 1955; дакумент. «Калгас «Рассвет», 1952). З 1957 на «Масфільме»; зняў фільмы «Вышыня» (1957), «Мой малодшы брат» (1962), «Ганна Карэніна» (1968) і інш. Дзярж. прэміі СССР 1941, 1946. Узнагароджаны 2 ордэнамі.

ЗАРЫН, вельмі ядавітае атрутнае рэчыва нервова-паралітычнага дзеяння з ярка выражаным мятным эфектам (звужэнне зрэнкі), ізапрапілавы эфір фторангідрыду метылфасфінавай кіслаты.

Бясколерная вадкасць з слабым фруктовым пахам; шчыльн. 1094 *кг/м*³, добра растваральна ў вадзе, арган. растваральніках, усмоктваецца ў афарбаваныя і порыстыя паверхні, гумава-тэхн. вырабы. У арганізм пранікае праз органы дыхання, скуру і страўнік. Смяртэльная доза праз органы дыхання — 0,1—0,15 *мг/л* (праз скуру — 15 *мг/л*) на працягу 1 *мін*. Валодае кумулятыўным дзеяннем пры ўсіх спосабах пранікнення ў арганізм. Ахова і дэгазацыя такія ж, як ад *зарыну*. Гл. таксама *Атрутныя рэчывы*.

ЗАРЫЦКІ Аляксей Аляксандравіч [н. 9(22).3.1911, мяст. Хоцімск Магілёўскай губ.], беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1946. З служачых. Скончыў Маск. ін-т замежных моў (1936). У 1938—46 у Сав. Арміі. Друкуецца з 1927. Першы зб. вершаў «Эпічныя фрагменты» (1932). Найб. уласцівы паэту жанр эпічнай паэзіі. У лірыцы вылучаюцца гумарыст. і сюжэтна-лірычныя вершы, блізкія да балады. Гераічныя характары, дынамічны сюжэт, разгорнутыя псіхал. характарыстыкі ў паэмах «Аповесць пра залатое дно» (1954), «Пяцёра» (1957), «На волю» (нап. 1957—68). Фантастычная паэма «Вяртанне на Зямлю» (1964) — пра пяспяную прагу чалавека да пазнання Сусвету, да подзвігу. Аўтар зборніка апавяданняў па рус. мове «Верасовы мёд» (1965). Перакладае з рус., укр., літоўскай, нямецкай, польскай, лужыцка-сербскай моў. Узнаг. ордэнам Айч. Вайны 2-й ст., медалямі.



Тв.: Выбраныя творы, т. 1—2, Мн., 1969; Арлінія крыніца, Мн., 1947; Вершы і паэмы, Мн., 1952; Залатое дно, Мн., 1955; Пасылка ў рай, Мн., 1960; Размова з сэрцам, Мн., 1961; Вяртанне на Зямлю, Мн., 1966; Некалькі слоў пра слбе, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Стральцоў М. Жыццё ў слове, Мн., 1965, с. 32—53. *М. М. Барсток.* Мінск.

ЗАРЭСЦЕ, вёска ў Сухарэўскім с/с Магілёўскага р-на, на р. Раста. Цэнтр калгаса «Парыжская камуна». За 35 *км* на У ад Магілёва, 35 *км* ад чыг. ст. Лупалава. 111 ж., гасп. 44 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, фельч.-ак. пункт, аддзяленне сувязі, магазін.

ЗАРЭЦКІ Міхась (сапр. Касянкоў Міхаіл Яўхімавіч; 20.11.1901, с. Высокі Гарадзец Сенненскага пав. Магілёўскай губ.— 13.6.1941), беларускі савецкі пісьменнік. Сын дзяка. Вучыўся ў Аршанскім духоўным вуч. і Магілёўскай дух. семінарыі, якую пакінуў, калі пачалася рэвалюцыя. Працаваў перапісчыкам у паўвайсковай часці, вясковым настаўнікам (з пач. 1919) на Магілёўшчыне, заг. валаснога аддзела нар. асветы. У 1920—26 палітработнік Чырв. Арміі. Літ. дзейнасць пачаў у 1921. Быў чл. літ. аб'яднанняў «Маладняк» і «Полымя». Аўтар прасякнутых пафасам рэвалюц. рамантыкі апавяданняў, аповесцей і раманаў, п'ес. Стыль ранніх твораў З. ўзнёсла-рамантычны, фраза лірычна ўсхваляваная, квяціста-метафарычная. У апавяданнях паказаў, як працоўныя вёскі ўздымаліся на барацьбу з ворагамі рэвалюцыі («Бацькаў сын», «Ліпа»), далучаліся да актыўнай грамадскай дзейнасці («Цішка-бабыль»). Стварыў вобразы змагароў за перамогу новага ладу, узнімаў складаныя маральна-этычныя праблемы («42 дакументы», «Воргі», «Дзіўная», «Кветка пажоўклая»). У выразнэні некат. з іх выявілася супярэчлівасць пошукаў маладога З. Кастрычніку на Беларусі прысвяціў вострадраматычны, яркі па псіхал. характарыстыках, прасякнуты філас. роздум раман «Сцежкі-дарожкі» (1927). У ім паказаў лёс народа, пакутлівыя блуканні і пошукі інтэлігенцыі ў пераломны гістар. перыяд, пераход лепшай яе часткі на шлях самаадданага служэння рэвалюцыі. Напісаў п'есы «Віхор на балоце» (1928), «Белыя ружы» (1928—29), «Сымон Карызна» (1935), «Ная» (1936). У рамане «Вязьмо» (1932—33) праз драм. сутыкненне чалавечых характараў адлюстроўвае калектывізацыю. Праз лёс паасобных герояў З. раскрыў падзеі грамадскага жыцця, стварыў псіхалагічна абгрунтаваныя, напоўненыя глыбокім сац.-гістарычным зместам вобразы. Пераклаў на бел. мову раман «Цэмент» Ф. Гладкова (1930), «Прыгоды ўдалага вайкі Швейка ў сусветную вайну» Я. Гашака (ч. 1, 1931). У літ.-грамадскай дзейнасці З. былі паасобныя памылкі нацыяналіст. характару.



Тв.: Пела вясна, Мн., 1925; У віры жыцця, Мн., 1925; Пад сонцам, Мн., 1926; Голы звер, Мн., 1926; 42 дакументы і Двое Жвіроўскіх, Мн., 1926; На чыгунцы, Мн., 1928; Падарожжа на новую зямлю, Мн., 1929; Ракавыя жаронцы, Мн., 1930; Сцежкі-дарожкі, Мн., 1959; Вязьмо, Мн., 1962; Аўтабіяграфія, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.

Літ.: Гісторыя беларускай савецкай літаратуры, т. 1, Мн., 1965; Адамовіч А. М. Культура творчасці, Мн., 1959, с. 134—145; Ягож. Беларускі раман, Мн., 1961, с. 136—149; Пшыркоў Ю. С. Беларуская савецкая проза (20-я — пач. 30-х гг.), Мн., 1960; Беларуская савецкая проза. Апавяданне і нарыс, Мн., 1971; Скрыган Я. Кругі, Мн., 1969, с. 114—126; Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць, Мн., 1968, с. 39—44.

ЗАРЭЧКА, вёска ў Папінскім с/с Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл., на паўд. беразе Дняпроўска-Бугскага канала. Цэнтр калгаса «Дружба». За 18 *км* на Пд ад Драгічына, 228 *км* ад Брэста, 14 *км* ад чыг. ст. Драгічын; аўтобусныя зносіны з Драгічынам. 1304 ж., гасп. 321 (1971). Майстэрні камбіната быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Ням.-фаш. захопнікі спалілі больш за палову вёскі, загубілі 31 мірнага жыхара. Помнік воінам і партызанам Брэсцкага і Пінскага злучэнняў, якія 40 дзён утрымлівалі вясной 1944 фронт у раёне в. Белін і Зарэчка, помнік сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАРЭЧНАЯ СЛАБАДА, вёска ў Іванскім с/с Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Ула. Цэнтр калгаса «Чырвоная Слабада». За 0,5 *км* (цераз раку) ад Чашнікаў, 96 *км* ад Віцебска, 3,5 *км* ад чыг. ст. Чашнікі, на шашы Чашнікі — в. Бачэйкава. 207 ж., двароў 71 (1971). Б-ка.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Крыўчанскім с/с Брагінскага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Сцяг Леніна». За 12 *км* на У ад Брагіна, 149 *км* ад Гомеля, 38 *км* ад чыг. ст. Хойнікі. 401 ж., гасп. 133 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Вярэцкім с/с Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл., на р. Аўсянка. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 35 *км* на ПнУ ад Гарадка, 70 *км* ад Віцебска. 64 ж., гасп. 23 (1971). Ням.-фаш. захопнікі спалілі 25 двароў вёскі, загубілі 26 жыхароў.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., каля р. Бярноўка (1 *км*). Цэнтр Даўгапольскага с/с. За 22 *км* на ПнЗ ад Гарадка, 59 *км* ад Віцебска, на шашы, якая злучае вёску з Гарадком. 195 ж., гасп. 70 (1971). Пач. школа, вет. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «1 Мая». За 44 *км* на ПнУ ад Лагойска, 84 *км* ад Мінска, 56 *км* ад чыг. ст. Радашковічы. 153 ж., двароў 45 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, урачэбная амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі, магазін. Вёску двойчы (1943, 1944) часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, у маі 1943 загубілі 22 мірных жыхароў.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Пліскім с/с Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Дружба». За 11 *км* на У ад Смалявіч, 50 *км* ад Мінска, 1 *км* ад чыг. ст. Чырвоны Сцяг. 169 ж., гасп. 66 (1971).

«ЗАРЯ», грамадска-палітычная газета, орган Брэсцкага абл. і гар. камітэтаў КПБ, абл. і гар. Саветаў дэпутатаў працоўных. Выходзіць у Брэсце з 26.9.1939 пяць разоў на тыдзень на рус. мове. Разлічана на шырокія колы чытачоў. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам. і культурнага жыцця вобласці, пытанні меліярацыі Бел. Палесся, поспехі працоўных у камуніст. буд-ве. Рэдактар В. А. Каленчыц (з 1966).

Спачатку наз. «Рабочий» (№ 1—68; з'яўлялася органам Часовага ўпраўлення Брэста). З 1940 (з № 69) выходзіла як орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома на бел. мове пад назвай «Зара». У Айч. вайну (з 1.5.1943 да 28.7.1944) вы-

давалася падпольна на часова акупаванай ням.-фаш. захопнікамі тэр. Брэсцкай вобл. У 1944—62 выходзіла на рус. і бел. мовах.

В. А. Каленчык. Брэст.

«ЗАРЯ ЗАПАДА», адна з назваў газ. (1924—29) *«Віцебскі рабочы»*.

ЗАР'ЯН Наіры [сапр. Егіязар'ян Аістан; 31.12.1900(13.1.1901), с. Хараконіс Ванскага вілаета, Турцыя — 11.7.1969], армянскі савецкі пісьменнік. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Ерэванскі ун-т (1928). Друкавацца пачаў у 1921. Першы аб. вершаў «Блакітная краіна каналаў» (1926), паэмы «Рануш» (1926), «У лістападаўскія дні» (1926), «Татэўская скала» (1928) яшчэ схематычныя і абстрактныя ў паказе рэчаіснасці. Паэма «Рушанская скала» (1930) — першы ў арм. л-ры эпічны твор пра сацыяліст. пераўтварэнні ў вёсцы. Сац.-псіхал. працэсы ў вёсцы перыяду калектывізацыі адлюстраваў у рамане «Ацаван» (1937, працяг апубл. 1947). У Айч. вайну пісаў публіцыст. і лірычныя вершы (аб. «Распаленай душою», 1942), ліра-эпічныя паэмы («Голас Радзімы», 1943), драмы («Помста», 1942). Аўтар гістар. трагедыі «Ара Прыгожы» (1946), камедый «Каля крыніцы» (1948), «Доследнае поле» (1950), рамана «Пан Петрас і яго міністры» (1958). Пераклаў на арм. мову лепшыя творы А. Пушкіна, У. Маякоўскага, Я. Купалы. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Тв.: Рус. пер.— Ара Прекрасный, М., 1947; Избранное, М., 1954; Ацаван, М., 1960; Стихи, М., 1963.
Літ.: Агабабян С. Наири Зарян, Ереван, 1956.

С. В. Авабабян. Ерэван.

ЗАР'ЯН (Аракелян) Стафан Егіеевіч [4(16).9.1890, с. Каракліс, Арменія — 15.10.1968], армянскі савецкі пісьменнік. З сялян. Вучыўся ў мясцовай рус. школе. У 1906 пераехаў у Тыфліс, працаваў у арм. газетах. Друкавацца пачаў у 1909. У аб. апавяданняў «Сумныя людзі» (1918) выступіў супраць тагачасных сац. парадкаў. Багаты духоўны свет людзей з народу паказаў у апавяд. 1918—20 «Вайна», «Яблыневы сад» і інш. Аўтар аповесцей «Старшыня раўкома» (1923), «Дзяўчына з бібліятэкі» (1925), дзе ўпершыню ў арм. л-ры стварыў вобразы ўдзельнікаў рэвалюц. змагання ў Арменіі. Аўтар аўтабіягр. рамана «Гісторыя аднаго жыцця» (т. 1—2, 1934—38). Гістар. трылогія З. «Цар Пан» (1944), «Армянская крэпасць» (1959), «Вараздат» (1968) — пра гераічную барацьбу армян з чужаземнымі захопнікамі ў 4 ст. Пераклаў на арм. мову «Вайну і мір» Л. Талстога, лепшыя творы І. Тургенева, У. Гаршына. Творы З. перакладзены на многія мовы народаў СССР і за мяжою. Дэп. Вярх. Савета СССР 4—5-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Тв.: Бел. пер.— у кн.: Кветкі Арарата, Мн., 1964; рус. пер.— Царь Пан, М., 1946; Яблоневый сад. Повести и рассказы, М., 1948; Избр. произв., М., 1956; История одной жизни, М., 1961.
Літ.: Врайнина В. и Хитарова С. Стефан Зорьян, М., 1960.

С. В. Авабабян. Ерэван.

ЗАСЕЦКІ Пётр Іванавіч (1899—1941), рускі і беларускі савецкі спявак (тэнар). Нар. арт. БССР (1940). Вучыўся ў Саратаўскай кансерваторыі. Дэбютаваў у 1920 у оперным т-ры Растова-на-Доне, да 1924 працаваў у Опернай студыі Станіслаўскага і Вял. т-ры СССР, у 1924—37 у оперных т-рах Ленінграда. З 1937 саліст Бел. т-ра оперы і балета. Уласцівае З. майстэрства стварэння шматгранных, сацыяльна і псіхалагічна пераканаўчых вобразаў ярка раскрылася пры рабоце над бел. операмі «У пушчах Палесся» А. Багатырова (трагічная партыя Саўкі Мільгуна) і «Кветка шчасця» А. Туранкова (камічная роля Мікіты). З інш. партый (у розных т-рах): Міцук («Ціхі Дон» І. Дзяржынскага), Сяргей («Лэлі Макбет Мцэнскага павета» Дз. Шастаковіча),



П. І. Засецкі ў ролі Саўкі.

Лыкаў («Царская нявеста» М. Рымскага-Корсакава), Баіліо («Вяселле Фігара» В. А. Моцарта). Узнаг. ордэнам Працоўнага Чырв. Сцяга.

ЗАСЕЦЦЕ, вёска ў Дзятлаўскім р-не Гродзенскай вобл., на р. Дзятлаўка. Цэнтр сельсавета. За 3 *км* на Пн ад Дзятлава, 137 *км* ад Гродна, 16 *км* ад чыг. ст. Навасельле, на шашы г. п. Дзятлава — Ліда. 584 ж., гасп. 198 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік 22 сав. воінам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.



ЗАСІМ Мікола [Мікалай Арцёмавіч; 6(19).11.1908, в. Шані Пружанскага пав. Гродзенскай губ.— 19.7.1957], бел. сав. парт. Чл. КПСС з 1946. З сялян. У 1948 скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б. За рэвалюц. падпольную дзейнасць у 20—30-я г. ўлады бурж. польскі шмат разоў арыштоўвалі З., саджалі ў турму. У 1941—44 у партыз. атрадах, інструктар Антыфаш. к-та Брэсцкай вобл.; у 1944—46 заг. аддзела Пружанскага райвыканкома. Працаваў у Брэсцкай абласной газ. «Заря» (1948—57). Друкавацца пачаў (1926) у час. «Маланка», «Асва», газ. «Наша воля», «Наша праца» і інш. пад псеўд. Хланец, Агонь, Ацот, М. Асот, Міз. У Айч. вайну друкаваўся ў падпольных газ. «Заря», «За Родину». Першы аб. вершаў «Ад шчырага сэрца» (1947). Творы З. адлюстравалі сац. і паліт. аспекты жыцця сялянства Зах. Беларусі. Значнае месца ў палітры паэта займае сатыра, улюбёныя прыёмы — гратэск, народныя. На рус. мову творы З. пераклі А. Твардоўскі, М. Луконін. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Вершы, Мн., 1954; Выбранае, Мн., 1960; Аўтабіяграфія, у кн.: Пра час і пра сябе, Мн., 1966.
Літ.: Калеснік У. А. Час і песні, Мн., 1962.


У. А. Калеснік. Брэст.

ЗАСІНЦЫ, вёска ў Ельскім р-не Гомельскай вобл., каля р. Ясенец. Цэнтр сельсавета і калгаса «Шлях Леніна». За 47 *км* на ПдЗ ад Ельска, 224 *км* ад Гомеля, 32 *км* ад чыг. ст. Славечна. 284 ж., двароў 92 (1971). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, аддз. сувязі. У ліп. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Курган Славы з манументам у гонар воінаў-землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАСКАВІЧЫ, вёска ў Лебедзеўскім с/с Маладзечанскага р-на Мінскай вобл., на р. Уша. Цэнтр калгаса «Светлы шлях». За 24 *км* на ПнЗ ад Маладзечна, 107 *км* ад Мінска, 6 *км* ад чыг. ст. Пруды; аўтобусная ст. на шашы Маладзечна — Смаргонь. 544 ж., двароў 173 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, 2 магазіны. Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ЗАСЛАЎЕ (летапісны Изяславль, Жеславль, Жаславль), гарадскі пасёлак у Мінскім р-не (да 1959 цэнтр Заслаўскага р-на), на р. Свіслач, пры ўпадзенні яе ў Заслаўскае вадасх. За 27 *км* на ПнЗ ад Мінска, на шашы Мінск — Маладзечна. Чыг. ст. (Беларусь) на лініі Мінск — Маладзечна. 4,7 тыс. ж. (1971). Прамысл. прадпрыемствы: асфальтавы і малочны з-ды, хлебазавод, прамкамбінат (шыферны, сталярны, карданажны цэхі), камбінат быт. абслугоўвання і інш. Сярэдняя школа, спец. школа-інтэрнат, муз. школа, дзіцячыя яслі-сад, Дом піянераў, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца.

Заслаўе. Вуліца Савецкая.





Герб роду Глябовічаў. 1-я пал. 17 ст. Кафлі. Знойдзены пры раскопках у Заслаўі.

З.— старажытнарускі горад. Даследаваўся А. М. Лявданскім (1926), Г. В. Штыхавым (1967—68), У. А. Гілепам (1969). Пры археал. раскопках выяўлены рэшткі горада канца 10—12 ст. (драўляныя пабудовы, сляды майстэрняў па апрацоўцы жалеза), кераміка, тыповая для Полацкай зямлі, жалезныя і касцяныя прылады працы і інш. вырабы. Паводле летапісных паданняў пабудаваны ў канцы 10 ст. кіеўскім кн. Уладзімірам Святаславічам і адданы ва ўласнасць жонцы Рагнедзе і сыну Ізяславу. Названы, мабыць, у гонар сына. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1127—28 у сувязі з паходам вял. кн. кіеўскага Мсціслава Манамаховіча ў Полацкую зямлю. У той час З.— умацаваны горад, цэнтр удзельнага *Ізяслаўскага княства*. З 14 ст. у складзе Вял. кн. Літ., да 16 ст. лічыўся горадам (местам). У 1345 літ. кн. Кейстут аддаў З. свайму пляменніку Яўнуту Гедымінавічу. У 1433 горад захоплены Свідрыгайлам і спалены, жыхары ўведзены ў палон. З 1539 З. уласнасць феадалаў Глябовічаў, з 1678 Сапегаў, з 1753 падканцлера Вял. кн. Літ. А. Пшаздзецкага. У 16 ст. тут існавала друкарня, у якой была выдадзена Біблія Сымона Буднага (1574). З 1793 у складзе Рас. імперыі, мяст. Мінскага пав. Сав. ўлада устаноўлена у ліст. 1917. У Айч. вайну пад З. адбываліся цяжкія баі. Да 28.6.1941 З. абаранялі 64-я стралк. дывізія Мінскага ўмацаванага раёна і 210-ы артыл. полк. У 1942—44 у Заслаўскім р-не з ням.-фаш. акупантамі змагалася партыз. брыгада «Штурмавая». 4.7.1944 вызвалены Сав. Арміяй.

На тэрыторыі З. знаходзіцца гісторыка-археалагічны запаведнік, які аб'ядноўвае: шматпластавае гарадзішча «Вал» (10—17 ст.) з *Заслаўскай Спаса-Праабражэнскай царквой* (16(?)—17 ст.), гарадзішча «Замочак», ці «Магіла Рагнеды» (8—11 ст.), і некалькі груп славянскіх могільнікаў 10—12 ст. (гл. *Заслаўскі курганны могільнік*).

Літ.: Даўгяла З. І. Заслаўе на Міншчыне, «Запіскі Аддзела гуманітарных навук», 1928, кн. 5; Штыхов Г. В. Заславль в свете раскопок 1967—1968 гг., у кн.: Тезисы докладов к конфер. по археологии Белоруссии, Мн., 1969.


У. А. Гілеп. Мінск.

ЗАСЛАЎСКАЕ ВАДАСХОВІШЧА (Мінскае мора, Ганалес, Ждановіцкае вадасховішча), найбольшы штучны вадаём на Беларусі, за


10 *км* на ПнЗ ад Мінска, на выш. 210 *м* над узр. м. Створана ў 1956 ад падпору плацінай р. Свіслачы ў Мінскім р-не. Пл. 31,1 *км*². Даўж. 10 *км*, найб. шыр. 4,5 *км*, сярэдняя 3,1 *км*, найб. глыб. каля 8 *м* (павялічваецца з набліжэннем да плаціны), сярэдняя 3,5 *м*, аб'ём блізкі да 108,5 млн. *м*³. Даўж. берагавой лініі 55 *км*. Схілы катлавіны спадзістыя, на Пд і У задзернаваныя, месцамі ўкрытыя хмызняком, каля ўпадзення р. Свіслачы і Ратамкі забалочаныя. Чаша З. в. да затаплення была забалочанай поймай рэк Свіслачы, Вячы, Ратамкі і Чарняўкі. 70% дна ўслана тарфянікам. 10 а-воў. Ледастаў з 1-й пал. снеж. да сярэдзіны красавіка. Ваганні ўзроўню вады на працягу года ў значных межах, у асобныя гады амплітуда да 170 *см* (найб. ўзровень у перыяд разводдзя). Таўшчыня лёду 50—70 *см*. Сярэднемесячная т-ра вады на паверхні: 13,2 (май), 18,2 (чэрв.), 19,8 (ліп.), 19 (жн.), 14,1 °С (вер.). Мінералізацыя вады 190—340 *мг/л*. Вадазбор (562 *км*²) на паўд.-ўсх. схілах Мінскага ўзв. на выш. 210—340 *м* над узр. мора. Рэльеф буйнаўзгорысты, парэзаны лагчынамі і ярамі, складзены пераважна з пясчана-гліністых грунтоў, у паніжэннях тарфянікі. Глебы дзярнова-падзолістыя, часткова тарфяна-балотныя. Каля 25% пл. ўкрыта мяшаным лесам (бяроза, хвоя, елка, дуб) і хмызняком. Пад балотамі і забалочанымі землямі 8% пл., пад ворывам 40%. З. в. значна зарастае ва ўсх. ч. (асака, плывунец, аер, раска). Водзяцца акунь, джгір, плотка, шчупак, верхаводка і інш. Уваходзіць у *Вілейска-Мінскую водную сістэму*. Месца адпачынку працоўных. Пры ўпадзенні р. Свіслачы ў З. в.— г. п. Заслаўе. Гл. іл. да арт. *Вадасховішча*. *К. К. Крыловіч*. Мінск.

ЗАСЛА́ЎСКАЕ КНЯ́СТВА, гл. *Ізяслаўскае княства*.

ЗАСЛА́ЎСКАЯ СПА́СА-ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́, помнік культавага дойлідства абароннага тыпу 16(?)—17 ст. Пабудавана ў *Заслаўі*. Пастаўлена на высокім узгорку, які абкружаны ровам і высокім валам з чатырма бастыёнамі на вуглах (гарадзішча «Вал»). У розныя часы належала праваслаўным, каталікам, кальвіністам, дамініканскаму ордэну.



Заслаўская Спаса - Праабражэнская царква. Агульны выгляд і план.



З. С.-П. ц.— бесстаўповы, аднанефавы, бязкімі шчытовым дахам. З захаду да царквы прылягае прыбудаваная ў 17 ст. 35-метровая вежа, унізе квадратная ў плане, у верхніх ярусах — васьмігранная. Пра перабудову царквы (зафіксаваны пераробкі 1678 і 1865) сведчаць рознахарактарная апрацоўка асобных частак фасадаў і таўшчыня сцен (уверсе сцены больш тонкія). Верхняя частка сцен, трактаваная як атык, замяніла сцены з байніцамі. Рэстаўрыр. ў 1967—71. *У. А. Чантурыя*. Мінск.


ЗАСЛА́ЎСКІ Яўген Восіпавіч [20.12.1844(1.1.1845), Варонежская губ.— 13(25).6.1878], рускі рэвалюцыянер. Са абяднелых дваран. З 1872 вёў сацыяліст. прапаганду сярод рабочых Адэсы. Пад яго кіраўніцтвам вясной 1875 узнік *«Паўднёварасійскі саюз рабочых»*. Лічыў пралетарыят найб. актыўным удзельнікам рэвалюц. руху, аднак не змог пераадолець уплыву народніцкай ідэалогіі. Пасля разгрому «Саюза» (снеж. 1875) арыштаваны і засуджаны (1877) па 10 гадоў катаргі. Памёр ад сухотаў у астрожным шпіталі.

Літ.: Вочаров Ю., Е. О. Заславский — основатель «Южнороссийского союза рабочих», М., 1926; Рабочее движение в России в XIX в. Сб. документов и материалов, т. 2, ч. 2, М., 1950; Итенберг Б. «Южнороссийский союз рабочих» — первая пролетарская организация в России, М., 1958.

ЗАСЛА́ЎСКІ Яўген Львовіч (н. 24.5.1920, г. Александрыя Екацярынаслаўскай губ.), беларускі савецкі архітэктар. Чл. КПСС з 1942. Канд. архітэктуры (з 1961). Пасля заканчэння Маскоўскага арх. ін-та (1949) працуе ў Мінску. З 1962 нам. гал. архітэктара Мінска. Удзельнік стварэння праектаў жылых і грамадскіх будынкаў, комплексаў, праектаў планіровак і забудовы ў Мінску (будынак Т-ва дружбы і культурных сувязей з замежжам, 1956; жылы раён Чыжоўка, 1964; шматпавярховыя жылыя дамы); у Віцебску (мост праз Дзвіну, 1951); серыі тыпавых праектаў жылых дамоў (1957) і інш. Адзін з аўтараў генплана Мінска (удакладненні 1964). З 1962 выкладчык Бел. політэхн. ін-та.

ЗАСЛА́ЎСКІ КАЛГА́СНА-САЎГА́СНЫ ТЭ́АТР, створаны ў Заслаўі ў 1938 з *Барысаўскага калгасна-саўгаснага тэатра*. Маст. кіраўнік П. *Данілаў*; акцёры С. Бульчык, С. Яворскі, А. Яфрэменка і інш. У рэпертуары: «Жаніцьба» М. Гогаля, «Сын народа» Ю. Германа, «Канец маскарада» Ю. Рудзько і У. Сталмаха, «Ганна» Я. Маўра. Першы паставіў «Партызаны» К. Крапівы (1-е месца на фестывалі ў Мінску і на Усесаюзным аглядзе калг.-саўг. т-раў у Маскве, 1939). У канцы 1939 рэарганізаваны ў *Пінскі абласны драматычны тэатр*.

ЗАСЛА́ЎСКІ КУРГА́ННЫ МАГІ́ЛЬНІК, могільнік 10—12 ст. каля г. п. *Заслаўе* Мінскага р-на. Захаваліся 3 курганныя групы. Даследавалі Р. Г. Ігнацьеў, М. М. Турбін, В. П. Судавалі Р. Г. Ігнацьеў, М. М. Турбін, В. П. Судзішчынскі, Я. П. Тышкевіч, А. М. Ляўданскі, С. А. Дубінскі, Э. М. Загарульскі, Г. В. Штыхаў. Раскапана 84 курганы. Пахавальны абрад (трупапалажэнне на грунце) у большасці выпадкаў паводле слав. звычаю галавою на З; ёсць пахаванні галавою на У. У жаночых курганах знойдзены пацеркі, бранзалеты, пярсцёнкі, скроневыя кольцы, гліняныя гаршкі, у мужчынскіх — наканечнікі коп'яў, сякеры, нажы, крэсівы, спражкі, манеты канца 10 ст. і інш. Могільнік належаў мяшанасці плямёнаў.



Рэчы дружыньніка з Заслаўскага курганнага могільніка. Дзярж. музей БССР.



Заслаўскі курганны могільнік. Курганная група.

му насельніцтву *крывічоў* і *дрыгавічоў*. Яго матэрыялы намагаюцца выкарыстаць для вызначэння межаў расселення гэтых плямёнаў.

Літ.: Ляўданскі А. Н. Археалагічныя раскопкі у м. Заслаўі Мінскай акругі, «Працы кафедры археалогіі Ін-та беларускай культуры», 1928, т. 1. *Г. В. Штыхаў*. Мінск.

ЗАСЛО́НА стратэ́гічная, спосаб абароны супраць інтэрвентаў і ўнутр. контррэвалюцыі, якім карысталася сав. камандаванне ў 1918 ва ўмовах недахопу рэгулярных узбр. сіл у Сав. Расіі.

Войскі З. дзейнічалі, аб'ядноўваючыся ў групы атрадаў (р-ны), якія апіраліся на вял. нас. пункты і гарады. З атрадамі З. у баявых аперацыях удзельнічалі і партыз. атрады. З. падзялялася на участкі атрадаў З.: Паўночны, Заходні, Курскі, Паўн.-Заходні і Паўднёвы. У крас. 1918 ад Фінскага заліва да Курска ў атрадах З. было каля 36 тыс. чырвонаармейцаў. Метады дзеянняў атрадаў З.— пераважна актыўная абарона. З ростам Чырв. Арміі і арганізацыяй рэгулярных часцей і злучэнняў участкі атрадаў З. сталі асновай для ўтварэння армій і франтоў.

ЗАСЛО́НАВА К. С. МУЗЕ́Й. Адкрыты 1.8.1948 у Оршы. У 5 экспазіцыйных залах (268 *м*²) і фондах музея каля 3 тыс. экспанатаў (1971). Гал. ў экспазіцыі — матэрыялы пра жыццё і дзейнасць К. С. *Заслонава*.

Сярод экспанатаў фотадакументальныя матэрыялы пра дзейнасць Заслонава ў даваен. гады; пра сувязь з Аршанскім падполлем, арг-цыю дыверсійнай групы на Аршанскім чыг. вузле, а пазней — партыз. атрада і брыгады; баявыя данясенні Заслонава Віцебскаму падпольнаму абкому партыі і ЦК КП(б)Б, вытрымкі з яго дзённіка і лістоў сям'і, карта-схема «Баявыя рэйды брыгады К. С. Заслонава», спіс страт, якія ў выніку 122 баёў прычынілі партызаны-заслонаўцы ням.-фаш. акупантам; працоўныя і баявыя ўзнагароды Заслонава, успаміны яго паплечнікаў. У вітрынах кнігі, песні, вершы пра гераічныя подзвігі Заслонава на многіх мовах народаў СССР.

У музеі зберагаюцца матэрыялы, прысвечаныя дзейнасці партызанаў і падпольшчыкаў Аршаншчыны ў Вял. Айч. вайну: дакументы, зброя, сродкі сувязі, абсталяванне партыз. друкарні, падпольныя газеты, лістоўкі і баявыя лісткі, асабістыя рэчы, дзённікі і лісты народных мсціўцаў, творы жывапісу і скульптуры. Экспануюцца стэнды: «Героі Сав. Саюза — аршанцы», «Удзельнікі вызвалення Оршы», «Заслонаўцы сёння», «Орша мінулая і сучасная» і інш. З дня адкрыцця музей наведала больш за 1757 тыс. чал., у 1970 каля 50 тыс. чал.

Літ.: Силин М. Д. и Якутенок А. Ф. (сост.). Путеводитель по залам музея Героя Советского Союза К. С. Заслонова, Витебск, 1970. *М. Д. Сілін*. Орша.

ЗАСЛО́НАЎ Канстанцін Сяргеевіч [партыз. мянушка Дзядзька Косця; 25.12.1909 (7.1.1910), г. Асташкаў Цвярской губ.— 14.11.1942], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1942. Скончыў прафес.-тэхн. школу ў Вялікіх Луках (1930). Працаваў у чыг. дэпо ст. Віцебск, з 1937 нач. паравознага дэпо ст. Рослаўль, з ліст. 1939 — ст. Орша. Увосень 1941 па ўказанні парт. органаў сфарміраваў з чыгуначнікаў партыз. атрад, перайшоў з ім у тыл ворага, уладкаваўся на працу ў Аршанскае чыг. дэпо і ўначаліў сетку падпольных дыверсійных груп, якія паралізавалі работу Аршанскага чыг. вузла. За 3 мес. падпольшчыкі-заслонаўцы арганізавалі каля 100 крушэнняў паяздоў, вывелі са строю, знішчылі больш за 200 паравозаў, тысячы вагонаў і цыстэрнаў, звыш 200 аўтамашын і інш. тэхнікі ворага. З сак. 1942 на чале партыз. ат-



рада, з ліп. 1942 — партызанскай брыгады «Дзядзькі Косці». Арганізоўваў дыверсіі на чыгунцы, узначальваў баі з нім. акупантамі на тэр. Аршанскага, Багушэўскага, Сенненскага, Лёзненскага і інш. р-наў. Загінуў у баі з карнікамі ў в. Купаваць Сенненскага р-на. У Айч. вайну 2 партыз. брыгады былі названы імем З. У Оршы створаны музей (гл. *Заслонава К. С. музей*) і пастаўлены (1955) помнік на яго магіле каля вакзала. Яго імем названы дэпо ст. Орша, сярэдняя школа і школа машыністаў у Оршы, чыг. станцыя ў Лепельскім р-не, калгасы, вуліцы ў многіх гарадах і вёсках, дзіцячая чыгунка ў Мінску. Подзвігам З. прысвечаны маст. кінафільмы, творы л-ры, жывапісу, скульптуры, музыкі. Пра яго складзены нар. песні і легенды.

Літ.: Иванов В. Константин Заслонов, у кн.: Люди легенд, в. 1, М., 1965; Лобанок В. Е. Партизаны Витебщины в боях за Родину, Мн., 1959; Папоў Ф. і Шчуцкі С. Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў, Мн., 1951; Лынькоў М. Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў, Мн., 1944; Крушинский А. Взрывы над Днепром, М., 1964. *М. І. Камінскі.* Мінск.

ЗАСЛОНАЎКА, вёска ў Веравайшанскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл., на р. Адроў. Цэнтр саўгаса «Забалацце». За 9 *км* на З ад Оршы, 89 *км* ад Віцебска, на шашы Орша — в. Смаляны. 432 ж., гасп. 127 (1971). Вінаавод. Клуб, дзіцячыя яслі-сад, амбулаторыя, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

ЗАСЛУЖАНЫ АГРАНОМ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным аграномам калгасаў, саўгасаў, н.-д. устаноў с. гасп., с.-г. органаў за выдатныя заслугі ў развіцці с. гасп. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 16.12.1953.

ЗАСЛУЖАНЫЯ АГРАНОМЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1956. К. К. Хабенка. 1958. М. І. Гарленка. 1960. А. М. Багамолаў, Г. К. Вяржбіцкая, Г. С. Канапкоў, Н. А. Тасенка. 1964. А. С. Магазіншчыкаў, І. С. Малочка, І. П. Сікора. 1965. І. Ц. Гарбенка, М. М. Куляшоў, П. Дз. Холад. 1966. З. І. Баркоўскі, Я. М. Вішнюк, М. Ф. Глушаніна, Р. К. Данільчанка, А. С. Дрозд, Н. М. Еўсікава, Р. І. Жвалеўскі, А. М. Жукава, Л. М. Жэбрак, Г. С. Канельская, В. Ф. Левічаў, С. Я. Лейтэс, В. С. Пакроўская, Х. Я. Федасенка, К. І. Хазяпін, А. П. Хамяк, Л. І. Чулкова, Т. Ц. Шамшура, Ф. Н. Шаравараў. 1967. П. Ф. Барысаў, Р. В. Грашчанка, І. Р. Лінкевіч, Я. Ф. Міранавіч, Г. Г. Шчоткіна. 1968. У. А. Адамовіч, А. В. Алексаў, В. В. Бельскі, А. І. Бычкоў, М. І. Гамза, М. З. Гелахава, Е. А. Голікава, П. Ф. Кавлова, І. Р. Казута, І. Я. Карцэвіч, С. А. Коласаў, В. М. Мурашка, І. Ц. Палякоў, А. І. Пікулік, Л. М. Пунтус, М. І. Сулкоўскі, С. П. Супрон, М. М. Тарасевіч, С. В. Чыжэўскі, С. А. Шыман. 1969. Я. Я. Залескі. 1970. І. І. Адамаў, Г. М. Палянская.

ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР рэжысёрам, артыстам усіх жанраў, кампазітарам, дырыжорам і музыкантам, што стварылі высокамастацкія вобразы, спектаклі, кінафільмы, музычныя творы і спрыяюць сваёй дзейнасцю развіццю мастацтва. Упершыню ганаровае званне З. а. БССР прысвоена Пастановай СНК БССР ад 16.4.1928. З 1938 званне прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Парадак прысваення ганаровага звання З. а. БССР устаноўлены Палажэннем пра ганаровыя званні Беларускай ССР, якое зацверджана Указам Прэзідыума Вярх. Савета Беларускай ССР ад 4.7.1940.

ЗАСЛУЖАНЫЯ АРТЫСТЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1928. Е. А. Міровіч. 1931. У. М. Крыловіч. 1933. У. У. Кумельскі, У. І. Уладамірскі (Малейка). 1934. Л. М. Літвінаў. 1935. А. К. Ільінскі, А. М. Кальцаты, Р. М. Свярдлова, А. М. Файнерман. 1936. Л. П. Александроўская, У. І. Дамашка. 1938. Л. Ф. Аляксеева, Дз. А. Арлоў, Ю. С. Арончык, С. С. Бірыла, А. Л. Вяссмертны, З. А. Васільева, В. У. Галіна, Г. П. Глебаў, М. І. Дамінісаў, І. Ф. Ждановіч, М. П. Звездачотаў, М. А. Зораў (Штоклянд), Р. М. Капэльніцкі, П. С. Малчанаў, Р. В. Млодзік, І. А. Мураўскі, А. В. Нікалаева, Б. В. Платонаў, І. Р. Разенка, Л. І. Ржацкая, М. Б. Сокал, Ц. М. Сяргейчык, А. Я. Трэпель. 1939. І. М. Балоцін, Г. Ю. Грыгоніс. 1940. М. Я. Аблаў, Г. Б. Абуховіч, А. Н. Аніта, А. Дз. Арсенка, А. В. Астахаў, А. В. Багатыроў, А. А. Бельскі, М. А. Бергер, Р. П. Блюмберг, С. Ф. Бычкоў, М. С. Бялінская, В. Я. Галаўчынер, К. Я. Галляйзоўскі, С. Ю. Друкер, П. І. Засенін, П. С. Златагораў, П. І. Іваноў, В. В. Каліноўскі, А. К. Клумаў, М. Я. Кропшер, В. П. Ліпін, І. І. Любан, В. М. Малькова, К. З. Мірскан, М. М. Моін, І. А. Мусін, С. У. Палонскі, В. М. Пола, С. У. Скальскі, І. Б. Шаціла, А. Р. Шэлер. 1942. А. Ф. Усачоў. 1943. К. М. Саннікаў. 1944. М. І. Алдаў, І. І. Жыновіч, Б. К. Кудраўцаў, Л. А. Марцінавіч, М. А. Міцкевіч, П. В. Нікандраў, А. П. Рагалеўская, Я. С. Рамановіч, З. І. Рознер, С. М. Станюта, А. М. Трус, В. І. Чэмберс, А. Л. Шапс, У. М. Шахрай. 1945. С. В. Дрэчын, Б. А. Пакроўскі. 1946. Э. П. Шапко, Л. П. Шыкін, Б. З. Янпольскі. 1947. А. Ф. Кістаў. 1948. В. Ф. Валчанецкая, Г. А. Волкаў, М. Дз. Ворухаў, Я. К. Глебаўская, М. А. Кавязін, Т. Г. Карамеш, Г. В. Качаткова, Я. М. Палосін, В. В. Пацэвіч, П. А. Пекур, І. П. Сайкоў, М. М. Сяржоў, С. Л. Талкачоў. 1951. Н. І. Гусельнікава, М. А. Зіванаў. 1952. А. І. Лагоўская, Ф. І. Шмакаў. 1953. А. А. Бараноўскі, Л. С. Драздова, Я. А. Карнухаў, А. М. Савіна, З. Ф. Стома. 1954. Р. В. Аспенка. З. І. Браварская, Л. Ф. Бражнік, У. М. Гаваў, Я. М. Глінскіх, П. Ф. Дзянісаў, З. І. Канапелька, П. С. Крук, В. І. Крыкава, К. К. Кудрашоў, М. А. Лазараў, І. К. Лакштанава, К. А. Мухіна, Т. М. Ніжнікава, Г. К. Нікрасаў, Л. М. Ражкова, В. Ф. Сербін, Т. І. Шымко. 1955. М. П. Абрамаў, У. У. Алоўнікаў, Т. Н. Аляксеева, В. А. Белы, А. І. Білібін, В. М. Браянкоў, С. С. Бунькін, К. І. Бянеўскі, Л. У. Голуб, Н. С. Давыдзенка, А. М. Данілоўіч, Т. П. Заранок, В. С. Захарэвіч, С. П. Іванова, Т. Ф. Канавалава, В. А. Кратко, М. І. Кузьменка, Б. П. Макараў, А. М. Маралёў, П. А. Маркін, Г. Р. Мартынаў, Л. П. Маціеўскі, Я. Ц. Мілаеў, В. П. Міронаў, Н. Ф. Младзіёнкін, А. М. Навіцкі, Т. М. Пастуніна, І. А. Рэйзіна, Ю. І. Сляпнёў, Ю. М. Стальмакоў, М. П. Тэадоровіч, Б. В. Уксусаў, М. І. Цурбакоў, Г. І. Шмелькін, А. І. Шах-Парон, А. В. Шкапскі, Х. І. Шэйнін, М. Р. Шуманскі, В. Дз. Шутаў, М. К. Шэлег, М. М. Яроменка. 1956. М. Я. Астанкава, Г. П. Гінаецкі, М. У. Кавязіна. 1957. А. П. Асторына, Л. І. Галушкіна, Я. М. Кімберг, І. С. Папоў. 1958. А. А. Астрамецкі, Ю. С. Гальперына, А. М. Генерал, В. І. Глушакоў, В. П. Дуброўскі, В. Р. Кабалаў, А. І. Клімава, І. А. Матусевіч, А. П. Раенскі, М. Л. Співак, М. Л. Федароўскі, В. І. Юневіч, С. І. Яворскі. 1961. А. С. Аркадзьеў, С. П. Асіновіч, Л. С. Весніна (Ядзіткіна), Л. А. Гамуліна (Шубкова), У. М. Говар-Бандарэнка, В. К. Давыдаў, С. Т. Давыдаў, А. А. Карэлінкова, Б. З. Картышаў, (Равенблат), П. М. Кірыльчанка, Г. С. Лагоў, А. П. Майзлер, Г. К. Макарава, У. Я. Мартынаў, І. М. Савельева, Т. М. Скарута, Т. В. Трушына, Ю. І. Уласаў, М. М. Шышкін, Е. Я. Эфрон. 1962. В. В. Нікольскі, Г. К. Панкрат. 1963. І. С. Абрамік, М. У. Адамейка, З. І. Бабій, А. М. Вязаў, Л. Д. Гарэлік, Р. В. Дзідзенка, С. І. Еўдашэнка, А. Г. Кременская, А. С. Каменскі, А. К. Логінаў, А. М. Самараў, Г. Д. Светашаў, Ю. У. Сідараў, В. П. Тарасаў, Н. А. Ткачэнка, С. Ф. Хацкевіч, В. М. Чарнабаеў, А. С. Шаг-Наважылаў, М. І. Шошчык, Р. І. Янкоўскі. 1964. Л. Р. Ганестава, В. Дз. Ганчарэнка, В. Ф. Грачынскі, І. Дз. Дзідзічэнка, П. В. Дружына, Р. Е. Красоўская, Н. С. Нікеева, Н. Б. Парошына, Н. А. Ражнова, А. М. Саўчанка, Ю. П. Ужанцаў, Р. Я. Яўраеў. 1965. Л. Я. Стасевіч. 1966. В. В. Антонава, М. А. Апанасенка, Г. В. Аўдзеенка, К. М. Верамейчык, П. П. Дубашынскі, В. В. Катаеў, А. А. Лялюўскі, М. І. Маліноўскі, З. І. Малчанава, Г. П. Маркіна, М. П. Маркоўская, В. В. Марозава, Т. В. Мінсарава, Б. М. Пянчук, Л. І. Сторажава, І. А. Цюрын, С. П. Юркевіч, С. С. Яскевіч. 1967. С. І. Аляксандраў, В. А. Бурковіч, В. Л. Вуячыч, В. Ф. Гур'еў, М. Г. Захаравіч, М. А. Зорын (Табашнікаў), Дз. І. Зубрыч, Дз. І. Іванова, У. А. Калашнікаў, Н. А. Карнеева, Г. Я. Клачко, Б. М. Левін, В. С. Окалаў, М. У. Пятрова, І. І. Раеўскі, А. А. Рачоў, А. А. Рудакоў, Б. Г. Скабло, У. І. Слаўкоў, Г. В. Токараў, П. П. Філіпаў, Р. С. Філіпаў, Н. Р. Фядзяева, Л. Я. Цімафеева, Л. С. Чахоўскі, Л. І. Юзафовіч, А. А. Яфрасменка. 1968. Г. А. Арлова, А. І. Бірычэўскі, В. В. Воінаў, Н. М. Ганчарэнка (Еўдашэнка), Г. М. Гарбук, Л. М. Давідовіч, С. П. Данілюк, Ф. М. Іваноў, У. М. Кавальчук, В. Л. Кірычэнка, У. А. Куляшоў, І. Л. Курган (Эйдэльман), Р. Ф. Маленчанка, Б. А. Масумян, М. П. Пало, А. В. Рынковіч, Ю. В. Смірноў, Л. П. Стафанава, Г. Л. Храмушын, А. А. Цароў, П. Р. Чабаненка, В. Р. Шаўкалюк, Т. Р. Шашкіна. 1969. Б. В. Барысёнак, В. Ц. Лебедзеў, У. П. Уласаў. 1970. П. В. Кармушін, Т. А. Кокштыс, І. П. Лакштанаў, Э. Л. Мілуць, Я. П. Паўловіч, А. П. Рыжкова, Г. С. Талкачова, Б. У. Уладамірскі, Я. П. Яравой.

П. М. Ерашкевіч. Мінск.

ЗАСЛУЖАНЫ АРХІТЭКТАР БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным архітэктарам за вял. заслугі ў развіцці бел. сав. архітэктуры, за выдатную творчую дзейнасць у галіне горада-будаўніцтва, за стварэнне сучасных грамадзянскіх, прамысловых і сельскіх архітэктурных комплексаў, будынкаў і збудаванняў, якія атрымалі ўсенароднае прызнанне. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 14.6.1968.

ЗАСЛУЖАНЫЯ АРХІТЭКТАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1969. В. М. Аладаў, М. І. Бакланаў, С. В. Баткоўскі, Г. М. Бенядзіктаў, В. І. Гусеў, В. В. Ладыгіна, М. Н. Ліўшыц, Г. А. Парсаданаў, Ю. В. Шміт. 1970. А. Ю. Данілава, П. С. Рудзік. 1971. З. М. Леўчанка.

ЗАСЛУЖАНЫ БУДАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета БССР работнікам будаўнічых і праектных арганізацый, прадпрыемстваў будаўнічых матэрыялаў, канструкцый і дэталяў, навукова-даследчых устаноў у галіне будаўніцтва за вял. заслугі па ўкараненні новай тэхнікі, перадавых метадаў працы, паляпшэнні якасці, зніжэнні кошту будаўніцтва. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 11.6.1960.

ЗАСЛУЖАНЫЯ БУДАЎНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1960. У. Ц. Атрошчанка, Е. С. Галаўнёва, С. А. Грыгор'еў, В. Ф. Дзем'янюк, А. А. Дзігілевіч, І. А. Доўнар, А. А. Жалняровіч, Р. С. Забалееў-Ізотаў, Я. Ф. Кавлоўская, З. А. Каратневіч, І. К. Колычаў, А. С. Лапуноў, М. Х. Ломскі, У. П. Маскалёў, В. І. Свецікаў, В. А. Слепухоў, П. М. Сцяблюк, Ц. К. Фандо, Я. Ф. Філічонак, П. Г. Фядоценка, І. Э. Шаблоўскі, В. Ш. Шайхлісманаў, С. І. Яраш-эвіч. 1961. А. В. Астроўскі, У. М. Варакосін, В. К. Гаравой, А. М. Громаў, М. К. Гуд, І. К. Дуброўскі, Г. У. Заборскі, А. Ц. Маграшоў, В. Дз. Макавец, Т. М. Макараў, Л. А. Нопікава, І. А. Паддубіцкі, М. І. Паўлаў, М. М. Сівухін, М. П. Тарасенка, І. Дз. Шлапакоў. 1962. Р. А. Абразцова, А. С. Абухоўскі, Я. І. Анісімаў, Ф. Ф. Арцёменка, С. С. Атаеў, П. Л. Бабак, А. Г. Базаеў, С. С. Батурын, М. Н. Богуш, К. А. Бондараў, Л. С. Булах, М. Л. Вараб'ёў, І. П. Ведзмедзь, А. П. Воінаў, М. С. Галуза, Г. М. Глезер, І. І. Грыгаровіч, Л. А. Жук, І. М. Жыжаль, У. В. Казюля, А. Н. Каралёў, У. А. Кароль, М. В. Кашчэеў, Н. І. Лісавец, К. А. Магілеўскі, А. С. Мазейка, В. А. Мароз, У. Г. Міхайлаў, А. Ф. Мураўскі, Л. С. Паперна, Г. П. Паўлоўскі, В. Л. Пятніцкі, І. М. Рабцаў, Р. І. Рубанаў, М. А. Спірскі, М. П. Семяноў, Г. І. Страіцелеў, В. А. Талмачоў, С. М. Траногін, В. Л. Трэйда, В. М. Фамін, М. А. Хомчанка, В. Я. Цвяркун, П. П. Цімашэнка, К. П. Цюцюноў, М. В. Шчэпкін, І. А. Юркоў. 1963. А. В. Анцімонаў, М. Ц. Архіпец, Л. М. Ашмян, В. С. Бабкоў, Ф. Ц. Бажок, А. У. Байцова, І. С. Бахір, Я. Е. Гайко, Я. П. Гоцін, А. П. Гушча, К. У. Джыгера, Г. Я. Жолудзеў, В. П. Зеніч, А. С. Крэмень, А. В. Круль, М. С. Кускоў, В. С. Левін, М. Ф. Майданоўіч, Л. П. Мацкевіч, М. М. Машкін, У. М. Мудры, С. І. Мядзведскі, В. Ф. Наймушын, П. М. Новікаў, Я. Ф. Паўленка, А. Ш. Плоткін, Я. А. Раговін, М. З. Санкін, Г. І. Татурын, А. В. Уласевіч, К. Дз. Цвярдоў, І. М. Чарненка. 1964. І. А. Вілепскі, М. Дз. Галубенкаў, М. В. Кавалёў, І. І. Корсакаў, В. С. Крыніцкі, Р. І. Міланоўіч, А. В. Пруднікаў, У. М. Рубанік, В. Ф. Хлімянцоў, Л. С. Храмцоў. 1965. А. В. Бандаранка, П. І. Бязручкін, А. К. Ворса, І. М. Вятрук, І. Ц. Гапеенка, М. Я. Глушанкоў, М. К. Дзямешка, Ф. І. Дудараў, У. М. Жур, А. І. Кавалеўскі, М. У. Конік, Ф. Я. Крот, Ц. М. Кушнераў, В. С. Ларын, Р. І. Лебедзеў, У. Я. Ліцкевіч, П. С. Лукашук, А. Дз. Майсяновіч, М. Я. Мананкоў, Б. М. Марагоўскі, В. Г. Маршалаў, М. С. Медзведзенка, Г. К. Мітраховіч, Дз. Ф. Міхайленка, П. М. Навапражэўскі, П. Ф. Пацей, А. А. Пількевіч, С. М. Раўкоў, Я. Ф. Савіцкі, І. С. Салей, С. І. Серафімовіч, І. Х. Сіманоўскі, М. В. Скрабкоў, Л. С. Собаль, А. П. Старавойтаў, І. І. Сямак, К. М. Тандзітнікаў, М. Г. Ушкевіч, П. І. Чарнавусаў, В. П. Чарнышоў, М. І. Шалдыга, В. А. Шаршнёў, Г. П. Шмігельскі, М. І. Шымель, І. П. Янкоўскі, М. П. Яраш-эвіч. 1966. В. Е. Алексюк, К. А. Бародаіч, І. М. Бірыла, К. І. Варгін, Л. Я. Васілеўскі, Г. А. Вялічка, А. М. Гершаў, Г. С. Дашын, В. Р. Жылін, А. С. Зуб, С. Ф. Кажамякін, М. П. Кажан, П. І. Клімук, І. К. Лазарэнка, А. К. Лісоўскі, К. С. Мілашэўскі, А. Ф. Мітраховіч, Д. П. Надтачаеў, Р. Я. Паламарчук, Л. В. Парыйскі, Я. П. Ракомса, С. А. Сапун, П. Ф. Філіпаў, У. А. Хадорык, Ф. І. Цімафееў, С. Я. Цярохін, Л. К. Цяцерын, А. С. Чмыр, І. М. Шараеў, І. К. Юркоў. 1967. І. С. Вараб'ёў, М. П. Варанцаў, Я. І. Дрозд, А. А. Кавалевіч, М. М. Кавалевіч, Е. А. Каўгарэна, Ц. І. Кузьмін, А. Дз. Ланіда, М. В. Леаненка, Ф. Ф. Леановіч, Г. С. Бандарэнка, К. В. Вароніна, А. К. Васілеўскі, Л. Г. Гаўрылаў, Р. Я. Герцовіч, В. П. Глявіцкі, А. А. Грабеннікаў, М. А. Грыгарук, П. Р. Дадонаў, М. Г. Дзівакоў, А. Я. Каржуеў, М. К. Кесель, Ф. В. Магіленка, К. Я. Масько, М. І. Мацэль, М. М. Мядзведскі, І. Б. Палінскі, М. І. Пісарчык, С. Ф. Пятроў, В. Дз. Сабалеўскі, І. М. Сак, А. З. Сацікаў, А. І. Хамянкоў, К. С. Цывінскі, Ф. М. Шакай, Ф. І. Шчасны, Ф. І. Юшкевіч, В. Н. Ярковіч. 1969. Дз. Д. Атрашкевіч, Ю. К. Гарашчук, Г. М. Губчык, М. М. Епіфанаў, М. І. Касценіч, С. Ц. Кірыльчук, М. І. Кудзелін, А. В. Куліковскі, В. С. Курлена, І. В. Кушнераў, Ф. С. Маскоў, В. М. Няхаеў, П. Р. Паўлоўскі, А. М. Печкуроў, Дз. Дз. Прашчаеў, У. М. Рыжыкаў, С. П. Самуха, М. П. Сінцова, М. М. Унукоўскі, І. І. Ціханаў, А. А. Чыжык, С. М. Шахно, К. С. Якімовіч. 1970. П. Н. Антоненка, М. І. Бандзюк, С. С. Бычкоўскі, І. І. Валадашчык, А. Ф. Гаўрысёў, М. І. Герасімчук, Д. Ц. Гузман, Ю. Р. Іваноў, С. М. Ізотаў, І. П. Кавалёў, С. В. Казакоў, Л. В. Казлоў, В. І. Кандрацэнка, М. Л. Каралюк, Р. В. Куляеў, Л. І. Купічкіна, М. Р. Лукашэнка, Р. І. Ляшэнка, К. П. Мальковіч, С. І. Марцінчык, М. М. Матальцкі, М. Ф. Мацюк, А. І. Наканечны, Р. Л. Пабядзінскі, У. В. Пакацілаў, В. І. Пацюк, П. Я. Пісарчык,

М. А. Пісарык, Ф. П. Пыжык, А. А. Раманоўскі, А. А. Рамашэўскі, Д. Я. Родаў, М. Ц. Свінко, Р. С. Сілівончык, М. В. Сярмяжка, А. А. Тарасаў, А. А. Фурсевіч, Л. У. Чарапко, М. А. Шлойда, М. С. Шумакоў. 1971. І. А. Багданаў, Р. І. Бандарэнка, Л. В. Голубева, Ф. І. Кажарскі, І. І. Казлоўскі, С. І. Казлюк, Б. М. Кіціс, Р. Дз. Купрыенка, Ф. А. Лапуноў, У. У. Мішкевіч, М. І. Пунько, І. В. Сабалеўскі, П. М. Сідараў, А. І. Сініцын, А. Л. Трубіцкой, М. А. Федарчук, А. І. Цыганок, М. І. Яскевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ВЕТЭРЫНАРНЫ ЎРАЧ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР ветэрынарным урачам калгасаў, саўгасаў, зоаветэрынарных участкаў і пунктаў, дзярж. племянных расаднікаў, дзярж. заводскіх канюшняў і конных з-даў, інкубатарна-птушкагадоўчых станцый, ветэрынарных лячэбніц, н.-д. устаноў, ветэрынарна-прафілактычных і процізапізаатычных устаноў і с.-г. органаў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вял. заслугі ў галіне развіцця грамадскай, калгаснай, саўгаснай жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі, у павышэнні іх прадукцыйнасці. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 7.6.1949.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ВЕТЭРЫНАРНЫЯ ЎРАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1958. І. В. Казючыц. 1960. А. Ф. Келейкіна, А. П. Няронская, Н. Ф. Пінчук, Т. М. Феафілава. 1964. Е. В. Семечка, С. Р. Туманава. 1965. М. І. Будзько, В. В. Курбатаў, К. К. Фядорышчаў. 1966. С. Р. Балашэнка, Г. І. Балбуноў, М. Ф. Бялкоўскі, А. В. Губарэвіч, В. П. Дзёмінаў, М. В. Зайцава, П. В. Карпішкоў, І. М. Клябанаў, М. В. Кончыц, Н. М. Курыцына, П. С. Падуновіч, Ф. М. Сідарэнка. 1967. Я. В. Аляксанкін, Н. Д. Варановіч, М. З. Кавалеўскі, Дз. Г. Мальковіч. 1968. В. А. Андросаў, М. Ф. Афанасьеў, А. С. Ахрэмцаў, А. І. Гурын, М. П. Еўдакімаў, В. Р. Зайкоўскі, М. Я. Ігнатковіч, І. С. Машэкін, А. А. Паўлава, І. Ф. Рысінец, К. А. Самусік, У. М. Чайкоўскі. 1969. В. Н. Якубаў. 1970. А. Г. Рыжманаў.

ЗАСЛУЖАНЫ ВЫНАХОДНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР вынаходнікам — аўтарам укаранёных у нар. гасп. вынаходак, што робяць істотны ўклад у тэхн. прагрэс і маюць важнае нар.-гасп. значэнне, а таксама за шматгадовую стваральную вынаходніцкую дзейнасць. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 9.10.1959.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ВЫНАХОДНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1960. Д. Л. Калеснікаў, Ю. І. Карнацкі, Р. С. Неруш, Ю. М. Татараў. 1963. М. І. Несцярэнка. 1964. І. П. Агафонаў. 1966. Р. І. Халадзінскі. 1967. Дз. А. Антонаў, У. А. Белы, К. В. Кляменцьеў, А. Я. Розенберг. 1968. Ф. Ц. Лугаўнёў. 1970. В. У. Войцікаў, В. І. Жагіра, У. С. Кахановіч, І. Д. Мяніцкі, Л. М. Рэмаў.

ЗАСЛУЖАНЫ ГЕОЛАГ-РАЗВЕДЧЫК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, ступень адзнакі за выдатныя дасягненні ў геолага-разведцы і адкрыцці радовішчаў карысных выкапняў. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета Беларускай ССР 22.7.1968. Прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета БССР высокакваліфікаваным рабочым, інжынерна-тэхн. работнікам геалагічных, геафізічных, гідрагеалагічных, тапографа-геадэзічных служ-баў і н.-д. геал. устаноў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вялікія заслугі ў галіне геолагаразведачных работ, падрыхтоўкі і выхавання кадраў геолагаў і разведчыкаў петраў.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ГЕОЛАГІ-РАЗВЕДЧЫКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1968. А. А. Аўксенцьеў, В. А. Зайцаў, І. І. Зялінцоў, А. К. Калашынскі, П. А. Леанюк, У. І. Мельнікаў, П. А. Скалаба, В. Г. Тарбеев. 1969. М. М. Грыпінскі, В. В. Дайхціеўскі, Б. Ю. Жукоўскі, У. А. Каржаўскі, В. Р. Лебедзеў, Ю. І. Пазднякоў, А. П. Сянько, П. І. Хаўратовіч. 1971. М. Ц. Жузеў, А. А. Клапкоў, В. А. Караблёў, М. А. Таргонскі, І. І. Цімашэнка.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЁЯЧ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным работнікам культурна-асветных устаноў, кінафікацыі, радыёвяшчання і тэлебачання, друку, выдавецтваў, паліграфічнай прамысловасці, лектарам парт. камітэтаў і арг-цый т-ва «Веды» і інш. работнікам культуры за працу ў галіне культуры не менш як 10 гадоў і маюць вял. заслугі ў справе камуніст. выхавання шырокіх мас працоўных, развіцця сав. культуры, за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР ад 2.7.1957.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1957. П. М. Касач, Б. І. Любовіч, І. Б. Сікорскі, П. І. Шыдлоўскі. 1959. С. П. Астравуцкі, У. А. Жлуценка, У. Ф. Луцэвіч, М. М. Тышкін, М. І. Шчансновіч. 1960. С. М. Грабенчыкаў, А. А. Дзяруга, А. П. Лукомскі, Ф. Ф. Пятрэнка, П. А. Радоліцкі, В. М. Сакалоў, А. А. Слесарэнка, В. М. Смірноў, А. К. Шыдлоўскі. 1961. І. Б. Сакольскі. 1962. В. А. Захараў, М. І. Фрыдман. 1963. М. Т. Бяспалаў, Л. П. Вальчацкі, А. М. Валынчык, Н. Б. Ватацы, К. Дз. Гусеў, Р. Я. Кісялёў, М. Р. Сялапаў, А. Я. Фінкельберг, А. С. Чочыя, М. М. Чысцякоў, Л. І. Ячнеў. 1964. У. Я. Карпаў, А. Ф. Кутай, Л. Дз. Ляшэнка, Ф. М. Міхайлаў, А. С. Плеўскі, Р. П. Раскевіч, А. Г. Гусак. 1965. Дз. Р. Новікаў, М. М. Салдатаў, М. М. Сімкоўскі. 1966. М. Я. Дадзькоў, Ю. Я. Залатарэнка, У. І. Кулікоўскі, П. В. Мядзёлка, В. Н. Пазняк, С. П. Школьнікаў. 1967. А. М. Бачыла, А. У. Броўка, В. М. Варатнікоў, Б. З. Галубоўскі, М. А. Лынчоў, А. І. Каландзёнак, К. Ф. Калітоўская, Я. І. Кучан, Ф. Я. Кляцкоў, Г. Я. Кутневіч, Л. К. Кучэрава, І. В. Ляшчынскі, К. Л. Манучараў, Я. Г. Місько, І. Ф. Міхалюта, І. Р. Новікаў, В. П. Палескі, Станкевіч, В. Х. Партной, Д. Ш. Пінхасік, М. І. Пржыбытка, В. А. Пыжкоў, В. Е. Самуся, К. В. Суворай. 1968. У. І. Аніковіч, Г. Б. Асіпенкі, Л. Я. Бацвінник, І. А. Бейдзін, Г. В. Бушкі, М. М. Бяльзацкая, І. Я. Васілеўскі, Б. Я. Вішкароў, К. Г. Высоцкі, В. Ц. Гарбатоўскі, В. А. Данілевіч, Дз. М. Жураўлёў, М. В. Ісакоўскі, Э. О. Казачкоў, К. А. Калечыц (Буйло), М. Г. Кіракозаў, Л. У. Кісялёва, Я. А. Комік, Г. С. Лысоў, Л. С. Мазалькоў, М. Ц. Марушкевіч, Ф. М. Ніфагараў, А. А. Прокоф'еў, В. Ф. Праскураў, П. С. Пестрак, С. З. Спешка, Н. М. Сачанка, І. А. Серыкаў, В. П. Сяпляр, У. В. Таран, Г. Г. Ударай, І. М. Федарэнка (Янка Маўр), М. Я. Філімонаў, Я. А. Хелемскі, В. Р. Шапавалава, І. Р. Юшанкоў, А. В. Яблонскі, А. І. Якімовіч. 1969. А. С. Вялюгін, І. Д. Гурскі. 1970. К. Ц. Кірэенка, У. І. Корбан, Ц. В. Крыскоў (Васіль Вітка), Д. К. Міцкевіч. 1971. Т. М. Аляксеева, Т. П. Бастун, М. В. Гарбачоў, А. У. Лісоўскі, М. Дз. Троіцкая, М. С. Юрэвіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЁЯЧ МАСТАЦТВАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР рэжысёрам, мастакам, архітэктарам, кампазітарам, скульптарам і інш. дзеячам мастацтваў за выдатныя творы мастацтва, за вялікія заслугі ў справе выхавання і падрыхтоўкі мастацкіх кадраў, а таксама за стварэнне навуковых прац у галіне мастацтваў. Упершыню званне З. дз. м. БССР установлена 5.12.1927 і прысвойвалася Пастановаю СНК Беларускай ССР. З 1938 прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР. Парадак прысвоення ганаровага звання З. дз. м. БССР установлены Палажэннем пра ганаровыя званні Беларускай ССР, якое зацверджана Указам Прэзідыума Вярх. Савета Беларускай ССР 4.7.1940.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ МАСТАЦТВАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1934. І. Р. Лангбард, М. Г. Манізер. 1935. Б. Л. Брадзянскі, А. Вольны (А. І. Ажгірэй), Р. Я. Кобец, У. У. Корш-Саблін. 1938. З. І. Азгур, А. А. Бембель, А. В. Грубэ, М. А. Керзін, У. У. Кумельскі, Г. К. Папаніцкі. 1939. Я. М. Кругер. 1940. А. М. Бразер, А. П. Воінаў, В. В. Волкаў, Н. Б. Грубін, В. А. Залатароў, Я. У. Зільберберг-Скупнік, Н. І. Паніна, А. Я. Туранкоў, Я. К. Цікоцкі, П. І. Ціханаў, М. М. Чуркін, М. Э. Шпейдэрман. 1944. І. В. Ахрэмчык, А. В. Багатыроў, А. К. Глебаў, І. У. Жалтоўскі, Я. А. Зайцаў, У. М. Кудрэвіч, Ф. А. Мадораў, А. П. Марыкс, М. Ф. Садковіч. 1945. Н. Б. Лойтар, С. П. Нікалаеў. 1946. Л. М. Літвінаў (Гурэвіч), Р. Р. Шырма. 1949. Т. К. Лапацінa, М. А. Міцкевіч, Г. М. Пятроў, А. А. Рыбальчанка, І. М. Ушакоў, Г. І. Цітовіч, Л. А. Ярмоліна. 1952. А. В. Скібнеўскі. 1953. В. Ф. Фёдараў. 1954. Т. М. Каламійцава, Я. В. Кладухін, Л. У. Любімаў, П. В. Масленікаў. 1955. У. Л. Акуліч, Я. Э. Віцінг, А. І. Гінцбург, І. А. Гіттарц, А. Б. Грыгар'янц, А. Р. Зархі, Дз. А. Лукас, М. Ф. Маслаў, А. В. Міронскі, Я. Дз. Нікалаеў, Р. К. Пукст, С. І. Селіханаў, У. П. Сухаверхаў, В. К. Цвірка, В. А. Яфімаў. 1956. Б. Ф. Звінагродскі, Б. Х. Кабішчар, І. І. Любан, Л. І. Мазалеўская, К. А. Мулер. 1957. У. У. Алоўнікаў, К. К. Кавелка, П. П. Падкавырай, М. М. Пігулеўскі. 1959. Г. Б. Шчарбакоў. 1960. П. С. Акулёнак, Л. У. Голуб. 1961. А. Р. Апанасенка, Ю. А. Арыянскі, П. А. Данілаў, І. Л. Дорскі, В. Ф. Сербін, У. М. Стэльмах. 1963. Л. М. Абеліёвіч, А. Л. Андрэеў, Г. М. Вагнер, А. П. Кагадзееў, Дз. Р. Камінскі, К. М. Касмачоў, А. А. Паслядовіч, Ю. У. Семяняка, А. Дз. Шыбнёў. 1964. І. С. Абраміс, А. А. Булінскі, Я. Б. Парватаў, У. Дз. Станкевіч, М. М. Фігуроўскі, У. П. Цвяюк. 1965. К. П. Стацкі. 1966. А. В. Аладава, Н. М. Воранаў, Я. А. Глебаў, К. Л. Губарэвіч, С. Р. Раманаў. 1967. М. З. Бераў, І. Н. Вейняровіч, А. Дз. Забалоцкі, В. Р. Карпілаў, І. І. Кузняцоў, Л. М. Лейтман, К. І. Паплаўскі, С. К. Скварцоў. 1968. Е. М. Ганкін, М. Ц. Гуцеў, Р. У. Кудрэвіч, В. У. Роўда. 1969. М. Лужанін (А. А. Каратай), Р. І. Масальскі, І. А. Шульман. 1970. В. А. Грамыка, А. М. Дадышкіліяні, П. С. Крохалеў, П. К. Любамудраў, М. М. Марусалаў, М. А. Савіцкі, С. І. Сплашноў.

П. М. Ерашкевіч. Мінск.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЁЯЧ НАВУКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета БССР за асабліва каштоўныя працы ў галіне навукі і тэхнікі, за асабліва важныя для сацыяліст. буд-ва адкрыцці і вынаходкі ці за выдатную навукова-практычную і навукова-папулярызатарскую дзейнасць. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 7.8.1940.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1938. М. Л. Выдрын, У. В. Марзон, С. М. Мялкіх, М. М. Нікольскі, У. В. Шкацелаў. 1939. Ю. М. Іргер, Я. В. Корчыц, В. А. Лявонаў, Л. Я. Сітэрман,

І. Т. Цітоў. 1940. Ю. А. Вейс, А. К. Кедраў-Зіхман, Х. Л. Маршак, М. Н. Шапіра. 1944. Ц. М. Годнеў, А. Р. Жэбрак, В. М. Лубяка, М. Е. Макушок, К. М. Міцкевіч (Я. Колас), Л. М. Ніканаў, У. М. Перцаў, А. Я. Пракапчук. 1946. В. І. Трусевіч. 1948. У. В. Бабук, Ф. А. Яхімовіч. 1949. Х. С. Гарагляд, І. Я. Дземідзенка, К. М. Каратко, М. М. Краўцэвіч, З. К. Магілеўчык, М. Ц. Пятроў, П. П. Рагавой, М. Ф. Ярмоленка. 1951. М. І. Жыркевіч, І. С. Лупіновіч. 1956. І. Ф. Гаркуша, В. К. Захараў, В. І. Пераход. 1958. Л. С. Персіянінаў, М. К. Юскавец. 1961. С. І. Цімкоў. 1964. Т. В. Бірыч, Д. А. Маркаў, П. М. Маслаў, І. Дз. Мішэнін. 1965. Р. Ц. Вільдфлуш, М. А. Дарожкін, С. С. Захараў, І. М. Курбатаў, А. І. Новік, М. С. Савіцкі. 1966. М. У. Вінаградаў, Г. Х. Даўгяла, В. А. Маркс, Г. А. Мядзведзева, І. М. Старавойтаў. 1967. А. Дз. Адэнскі (Шінчук), І. А. Булыгін, В. Ф. Куприевіч, У. П. Лемеш, К. І. Лукашоў, М. Дз. Мухін, М. Дз. Несцяровіч, А. Н. Сеўчанка, Б. М. Сосіна-Ізраіцель, Б. І. Сцяпанаў, Э. П. Сюбарава, М. П. Яругін. 1968. І. В. Аляшкевіч, Ю. В. Гулькевіч, У. І. Крылоў, А. І. Міхельсон, А. Р. Мядзведзеў, В. І. Пансевіч-Каляда, П. Я. Пракопаў, В. Ф. Пятроў, С. Г. Скарапанаў, І. М. Сяржанін, Ф. І. Фёдараў, С. А. Чуніхін, В. І. Шэмпель, І. Д. Юркевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЁЯЧ НАВУКІ І ТЭХНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета БССР за асабліва каштоўныя працы ў галіне навукі і тэхнікі, за асабліва важныя для сацыяліст. буд-ва адкрыцці і вынаходкі ці за выдатную навукова-практычную і навукова-папулярызатарскую дзейнасць. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 7.8.1940.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ І ТЭХНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1949. Э. Х. Адэльскі, А. А. Краўцоў. 1954. Ф. П. Вінакураў, С. І. Губкін, М. В. Дарашэвіч, І. М. Ліўшыц, М. Я. Мацапура, В. В. Папоў, А. І. Рупкі, І. І. Рыжоў. 1958. Я. І. Дрозд. 1962. В. Л. Шапашнік. 1963. В. П. Севярдэнка, А. В. Трэйвас, І. Г. Ціхаміраў. 1965. І. Л. Любошыц. 1968. Г. В. Багамолаў, К. В. Горай, А. К. Красін, І. І. Купчынаў, М. М. Сірата, Д. А. Чудакоў.

ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЁЯЧ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным фізкультурным работнікам, трэнерам, выкладчыкам фізічнай культуры і актывістам фізкультурнага руху за вялікія заслугі ў развіцці фізічнай культуры і спорту. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 24.1.1967.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ДЗЕЯЧЫ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1968. І. Я. Будзько, М. І. Васільеў, В. Дз. Дзмітрыеў, І. В. Жыткоў, П. А. Злотнікаў, А. І. Кавалеўскі, Р. Р. Карпаў, К. А. Куліновіч, К. П. Нікіткоў, С. М. Салавей. 1969. А. В. Мядзведзь.

ЗАСЛУЖАНЫ ЗААТЭХНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным заатэхнікам калгасаў, саўгасаў, зоаветэрынарных участкаў і пунктаў, дзярж. племянных расаднікаў, дзярж. заводскіх канюшняў і конных з-даў, інкубатарна-птушкагадоўчых станцый, эксперым. баз, доследных станцый, н.-д. устаноў і с.-г. органаў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вял. заслугі ў галіне развіцця грамадскай, калгаснай, саўгаснай жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі, у павы-

шэнні іх прадукцыйнасці. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 7.6.1949.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЗААТЭХНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1955. М. М. Грабко, А. І. Саўпель. 1958. С. Дз. Лямешчанка, М. Я. Сіўцова. 1960. Н. Г. Міхалевіч. 1966. Н. Дз. Аўдзеенка, М. М. Дударава, М. С. Іукін, Ю. І. Кочкін, М. Я. Лемеш, Н. В. Падліпская, М. Ф. Сядоў, К. М. Шкуткова, А. М. Шумілава. 1967. Р. В. Карунны, М. І. Сухаручкін, Дз. Я. Хворасцін. 1968. А. І. Дуткоўская, Д. П. Зубкова, В. І. Ізмалкова, Л. А. Козел, А. С. Конан, Г. А. Лебедзеў, С. І. Тузаў, А. І. Шчарбакова, А. А. Якаўлеў.

ЗАСЛУЖАНЫ ЗЕМЛЕЎПАРАДЧЫК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным інжынерам-землеўпарадчыкам і тэхнікам-землеўпарадчыкам, якія маюць вял. заслугі ў галіне землеўпарадкавання і землекарыстання і працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 23.5.1968.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЗЕМЛЕЎПАРАДЧЫКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1968. С. Ц. Каржуеў, Р. М. Окрут, К. І. Плюскоў, С. Р. Фомчанка, Я. А. Хомчанка, М. І. Шалай.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛГАСНІК, ганаровае званне, якое прысвойваецца агульным сходам калгаснікаў ці сходам упаўнаважаных членам калгаса за заслугі ў калгасным будаўніцтве і ўмацаванні эканомікі гаспадаркі, за добрасумленную шматгадовую працу, актыўную грамадскую дзейнасць, прыкладныя паводзіны. Асобы, удастоеныя звання, маюць ільготы пры назначэнні пенсій, атрыманні жылля, пры карыстанні палівам, эл. энергіяй, калг. транспартам і інш. Імя З. к. заносіцца ў кнігу Працоўнай славы калгаса.

ЗАСЛУЖАНЫ ЛЕСАВОД БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным спецыялістам-лесаводам лясгасаў і леспрамгасаў, лясных і пладовых гадавальнікаў, саўгасаў, калгасаў, навукова-даследчых, лесаўпарадкавальных і інш. арг-цый і ўстаноў па лясной гаспадарцы, якія працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вял. заслугі ў развіцці лясной гаспадаркі. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 16.3.1963.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЛЕСАВОДЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1964. Я. І. Крыўчэня. 1965. І. П. Грыцэнка, Б. Дз. Жылкін, Ф. Ф. Кавалеўскі, Ц. М. Качаткоў, А. І. Літвінаў, Ф. С. Сушкевіч, Ф. Б. Трыбушэўскі, І. М. Хмялеўскі. 1966. Р. М. Капытаў, П. К. Мацвеенка, М. М. Палевікоў, Я. А. Сарокін. 1968. Р. Я. Арцёменкаў, Т. К. Бадунова, У. Г. Вядзьгун, М. К. Івашкавец, П. Д. Клімянкоў, С. П. Крывянкоў, К. Ф. Мірон, І. І. Пудаў, П. П. Хлебакаваў. 1969. Я. Г. Арленка. 1970. А. Д. Ганчароў, А. І. Даўгяла, С. Ц. Майсеенка.

ЗАСЛУЖАНЫ МАЙСТАР ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР за выдатныя поспехі ў галіне прафес.-тэхн. адукацыі майстрам вытворчага навучання тэхнічных, гарадскіх і сельскіх прафес.-тэхн. вучылішчаў, інспектарам рэсп. і абл. управленняў прафес.-тэхн. адукацыі, якія маюць стаж работы ў сістэме не менш як 10 гадоў. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета Беларускай ССР 30.8.1956.

ЗАСЛУЖАНЫЯ МАЙСТРЫ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1957. В. М. Жукаў, М. Г. Карпасаў, М. Р. Кімбоўскі, Л. А. Плансаў, В. А. Рудой, І. І. Сіповіч, Р. І. Харытонаў. 1965. М. М. Агаркоў, Л. М. Бардоўскі, М. П. Бурносаў, І. М. Васючэнка, Я. І. Гарбыльчык, В. А. Глушчэня, К. К. Елачкін, П. В. Жаркевіч, А. М. Зубрыцкі, В. І. Ігнатовіч, П. В. Жарлоўскі, Ф. М. Канабляеўскіх, Дз. В. Караванці, М. Дз. Кісялёў, С. І. Клімковіч, І. А. Корзун, С. А. Кот, П. А. Кошаль, В. І. Малчанаў, М. К. Мануліх, М. П. Молчан, І. Р. Ніжненка, З. А. Пятрэнка, І. Я. Перагуд, В. Л. Прусак, А. С. Прыгароў, В. Ф. Прэнз, С. К. Сініла, А. П. Тумашэвіч, Сакалоў, А. І. Хадарэнка, М. А. Чура, У. І. Чмелін, А. Ц. Чэпікаў, І. Т. Шайтур, М. І. Шымко. 1967. А. К. Асмалоўскі, Т. А. Баркун, В. І. Валахнко, І. А. Германовіч, Л. Я. Жадан, Ф. І. Жынко, С. В. Кавалеўскі, У. П. Кавалёў, С. В. Каралін, М. І. Красаўцаў, П. І. Куміцкі, А. А. Лазічны, А. Ф. Лішко, С. У. Міхайлец, П. А. Міцкоў, Я. М. Оберман, В. В. Позняк, І. А. Рыжанкоў, П. Ф. Свістуноў, Л. І. Спіцэвіч, У. М. Тарасенка, М. П. Хальчыцкі, В. К. Цяўлоўскі, А. М. Шагінян, В. Ф. Шасцітка, М. У. Якуш. 1968. П. А. Кавалёў, Н. М. Качаноўская, І. І. Лішчынскі, М. М. Поп, М. С. Тапырык, І. А. Ціханенка, С. І. Шэін, В. Дз. Шчалухін. 1970. М. П. Аксючыц, В. С. Біздзюкевіч, Л. Я. Буцько, Г. Ц. Гуеўская, Г. М. Карпава, У. С. Лугоўскі, В. І. Пернікаў, І. І. Рудзянка, А. А. Сабалеўская, М. Ц. Смалякоў, У. Я. Стардуб, А. І. Юшкевіч. *П. М. Ершкевіч, Мінск.*

ЗАСЛУЖАНЫ МАЙСТАР СПОРТУ СССР, гл. *Званні спартыўныя.*

ЗАСЛУЖАНЫ МЕЛІЯРАТАР БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным інжынерам-меліяратарам, тэхнікам-меліяратарам, механізатарам меліярацыйных машын і інш. работнікам меліярацыйных прадпрыемстваў і арг-цый, калгасаў, саўгасаў і п.-д. устаноў, якія працавалі па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і маюць вял. заслугі ў галіне праектавання, буд-ва і эксплуатацыі меліярацыйных сістэм і высокаэфектыўнага выкарыстання асушаных зямель. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 7.3.1963.

ЗАСЛУЖАНЫЯ МЕЛІЯРАТАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1964. А. Р. Віктаровіч, С. Л. Касцюк, І. А. Полікука. 1965. Б. У. Астаповіч, У. Я. Байдачнік, В. І. Барысік, Л. І. Бянько, Б. І. Дубро, П. А. Запольскі, А. Б. Ігнатовіч, М. М. Макась, П. І. Тумар. 1966. А. С. Вярхоўскі, Л. Ц. Калеснік, А. І. Корза, А. П. Летуновіч, Д. Ф. Райцаў, П. І. Шчытнікаў. 1968. І. І. Горбач, П. М. Далматовіч, І. С. Долбік, В. І. Жукаў, Я. Ф. Кабакоў, Э. Х. Кажухіна, М. Дз. Клімаў, К. М. Ласко, Л. Ц. Латкоўскі, І. А. Пажарыцкі, Я. П. Сарагавец, П. С. Саянкоў, М. М. Сурма, В. Ф. Шабека.

ЗАСЛУЖАНЫ МЕХАНІЗАТАР СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным механізатарам сельскай гаспадаркі, якія маюць вял. заслугі ў галіне механізацыі с. гасп. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 28.3.1961.

ЗАСЛУЖАНЫЯ МЕХАНІЗАТАРЫ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1962. М. К. Бандарук, М. А. Бруханскі, У. П. Кот, У. А. Купцоў, Ц. Ц. Радчанка, Л. М. Рай, Н. А. Цэдзілін, Л. І. Балабановіч, В. Д. Белянкоў, А. М. Булыгін, І. Р. Грышевіч, А. І. Даронька, Я. М. Дварацкі, Г. Д. Каліва, А. А. Паўлоўскі, М. В. Рудэнка, І. М. Сярэдзіч, А. А. Худанкоў. 1966. В. В. Анісім, І. П. Еўтухоў, А. П. Ліпніцкі, С. М. Малашэнка. 1967. С. А. Байгот, У. Я. Дзятлаў. 1968. Я. Р. Арановіч, В. М. Белілавец, Ф. А. Брынет, Н. А. Булавацкая, А. С. Валатоўскі, Л. В. Васільеў, А. В. Нерабей, Й. К. Дубоўскі, Г. П. Жолудзеў, Ф. І. Іваноў, А. Ц. Івашчанка, В. Г. Капуста, Т. С. Кобрусеў, Г. М. Козел, Р. М. Лазар, В. Н. Мазурка, А. Р. Макаганюк, А. Ф. Малочка, Р. В. Мацвееў, І. С. Міц, М. В. Навароика, У. М. Пятух, Г. І. Рабушка, І. Да. Разумаў, В. М. Рацкевіч, І. І. Салей, І. А. Сплендор, П. В. Старавойтаў, А. А. Сушкевіч, У. М. Сцежкін, І. С. Шкурапацкі, Р. С. Шпак, С. А. Якерсон, І. І. Яўціхеў. 1969. К. М. Дубоўскі. 1970. М. Р. Рашацкін, І. А. Чыкілеўскі.

ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР за выдатныя поспехі ў галіне народнай асветы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці настаўнікам і кіраўнікам пач., васьмігадовых, сярэдніх, спец. школ, школьным інспектарам і заг. аддзелаў нар. асветы, выкладчыкам і дырэктарам пед. вучылішчаў, заг. пед. кабінетаў, якія маюць стаж работы ў сістэме нар. асветы не менш як 10 гадоў. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета Беларускай ССР 4.6.1940.

ЗАСЛУЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1941. М. А. Акульміна, Н. Ф. Арлова, Я. В. Астроўскі, М. С. Арцюхоў, П. І. Біран, В. С. Бірыч, М. І. Гайсёнак, А. Г. Гарачун, А. С. Дарашчанка, К. А. Зайцава, І. К. Зіновіч, М. І. Канавальчыкаў, І. Г. Крукоўскі, А. Ф. Крылова, А. С. Крыцкая, Э. А. Лютарэвіч, Г. В. Макарава, П. С. Нікалаенка, А. Р. Нікіценка, Х. Р. Пранік, У. П. Пушкарэвіч, П. І. Сівой, Н. І. Сіўко, Д. К. Талкачоў, Г. В. Харытановіч, А. А. Шаплыка.

1944. І. М. Галынец.

1945. В. Р. Адэйцова, К. В. Асмалоўская, П. Г. Афанасьева, П. А. Бабіцкі, К. А. Барысевіч, Ю. І. Букатал, К. А. Бурдзілава, І. С. Вадэйка, Л. Г. Валачковіч, П. С. Васілеўскі, В. Л. Вільтоўская, І. П. Вольскі, А. П. Воранава, П. С. Вяндзіла, Г. П. Гілевіч, М. М. Гаваркоў, Я. Р. Грыгор'еў, Л. В. Грынаўцова, Г. Л. Дзіван, А. К. Дэлруга, Е. С. Елісеева, Н. П. Жукаў, А. І. Іваноў, М. А. Кавалевіч, М. К. Кандрацьеў, І. У. Капаевіч, В. Ц. Карпенка, А. А. Кармалітава, Г. І. Катлінскі, А. М. Кісялёва, К. Ф. Коршук, Б. Р. Крупадзёраў, В. С. Кузьміна, В. М. Кунько, В. М. Лаўрыновец, В. І. Ліяранцэвіч, Т. А. Лютароўская, М. С. Магільніцкая, П. Л. Макарэня, Ю. А. Марозава, З. П. Міроненка, С. А. Ніфіцін, Н. Я. Падпрэсная, М. Ф. Панёткова, В. А. Петрашкевіч, М. М. Прудніка, В. А. Прэйс, М. Р. Разоўскі, А. Н. Салоха, В. А. Самцэвіч, І. А. Сасіновіч, Г. К. Севярнёва, Я. У. Семяноўская, Н. І. Слайчэўская, М. Ф. Старычонак, М. М. Сяргеенка, Я. А. Федчанка, А. А. Чаркас, А. В. Чарноў, П. А. Чуліцкі, І. П. Шаплыка, Н. В. Шыдлоўская, А. А. Яўнас, Е. С. Яўсеева.

1946. Ф. С. Голуб.

1947. Я. Г. Абросава, В. С. Бандарчык, М. С. Баразнёнак, Р. Р. Барам, Л. М. Белавусава, Г. Р. Блау, А. М. Былінская, А. А. Васілевіч, Дз. А. Вінаградаў, І. А. Гальчук, М. П. Гапановіч, В. С. Гарбацэвіч, М. В. Голуб, Р. М. Гуткоўскі, М. Р. Дамарацкі, А. Я. Дарашэвіч, В. А. Дашук, І. А. Дзешчыц, С. С. Дзікавіч, П. І. Дубінін, Н. Я. Жыльчык, А. І. Ігнацьева, С. А. Казак-Цяста, Л. М. Кавалоўская, А. І. Калістратава, А. С. Карась, Г. М. Кац, А. Н. Котаў, Г. К. Кузняцоў, Е. В. Лазарэтава, Н. М. Лапушанская, П. М. Лепяшынскі, М. І. Лобан, П. С. Лубліка, А. І. Львова, Г. Ф. Лявонава, А. Я. Мажэйка, І. А. Пісарчык, Е. С. Прэйс, Я. М. Разумоўская, Т. Ф. Сапелкіна, І. А. Скрынікава, А. Н. Стахоўскі, Т. П. Сцяшковіч, П. П. Фядотаў, Г. У. Хадоска, А. Г. Цыкуноў, З. А. Чарнагорцава, М. П. Шабураў, С. Ф. Шаснеўская, А. А. Шаўко, П. П. Шымановіч, М. К. Яновіч, Г. А. Ярмусік.

1949. М. М. Азараў, Т. І. Азёрнікава, У. К. Азёрнікаў, А. Г. Александровіч, Я. В. Андрэева, К. А. Арлова, В. П. Арлоў, Д. Д. Арцімюк, Я. М. Баранава, А. П. Балтрушэвіч, В. І. Бальшова, Г. М. Буланчыкава, І. Р. Вадэйка, Ю. В. Валавікова, Г. А. Варановіч, В. П. Васілеўская, Л. Я. Васільеў, К. М. Весяліцкая, К. М. Вярыга, Л. А. Вяткіна, З. І. Дарашэвіч-Дынкіна, І. І. Жардзецкі, П. І. Забелін, К. М. Захар'яш, М. А. Казлоўская, А. П. Калецкі, Д. К. Карага, В. І. Кацімірава, І. І. Кмеша, Л. Т. Кур'ян, Я. Д. Кушнер, Г. М. Лабузноў, С. М. Латушка, Я. Г. Лахнова, М. І. Леанёнак, К. С. Лучкоў, Ф. Я. Лысянкоў, М. І. Малкова, К. І. Мілановіч, К. Р. Нікалаева, І. В. Папко, Ф. І. Раманюк, А. Ф. Рымараў, С. А. Сацэвіч, К. Дз. Севасцьянава, В. І. Смірнова, М. С. Стральчэнка, Я. І. Фашкевіч, М. І. Федчанка, Т. А. Хальпукова, М. Ф. Хальпукоў, І. Ф. Шаланкевіч, В. У. Шкарубская, І. А. Шмуляўцаў, К. П. Шчаглавітава, М. Я. Якушэвіч.

1950. А. Дз. Базыка, В. Я. Высоцкая, П. Дз. Гагарын, В. А. Гусарэвіч, З. С. Жгун, З. І. Закржэўская, П. А. Клімковіч, Н. А. Крыўцова, Т. А. Красоўская, А. Ц. Навіцкая, І. П. Новікаў, В. П. Пучкоўская, Л. А. Ржаўскі, Дз. С. Раздзёраў, А. М. Саламаха, А. П. Травулька, Я. М. Тэпо, М. Ф. Целяшоў, Р. В. Шакун.

1953. В. С. Багдановіч, М. К. Беразоўскі, Н. В. Міхалковіч, М. Л. Раман, У. М. Самусік, Г. Г. Субоціна.

1954. Ф. А. Азарава, І. Ф. Афанасенка, Г. В. Вайткевіч, З. С. Гуло, М. Ф. Гусак, В. В. Іванчыкава, М. І. Пяшкоўская, У. П. Раздаялоўскі, Ф. С. Скеп'ян, Н. М. Талецкая, Ф. Н. Чаўновіч.

1955. Т. І. Аўчынікава, С. Дз. Белы, Я. П. Бярэзіна, В. А. Варончанка, І. Р. Герман, В. В. Гурыновіч, Я. М. Дабратворская, Н. Я. Дарасевіч, А. Дз. Ермакова, З. П. Калашнікава, С. Дз. Кітовіч, М. П. Красоўская, П. П. Кулўскі, Дз. Ц. Лушчаеў, М. Г. Мазінг, М. Ф. Марчанка, Р. Ш. Мендзелева, Н. І. Міцкевіч, Г. Р. Новікаў, А. А. Папоў, В. І. Савіцкая, М. Г. Сачнёва, У. С. Сліж, А. С. Смаршкова, А. М. Тычына, П. У. Хадоска, М. Р. Чарнышова, Н. А. Шамоўская, С. М. Шарабайка.

1956. В. Л. Градзенчык, А. М. Дудар, Р. І. Жыгалевіч, Р. А. Зылькоў, К. А. Каліна, Н. С. Пятроўская, М. У. Салоха, Н. І. Сінская.

1957. В. Ф. Альшэўская, У. Ц. Альфер, С. С. Арлоўская, М. М. Арэхаў, М. М. Астраховіч, В. В. Багданенка, Т. А. Балтрукевіч, Дз. Ц. Басько, Д. В. Бекарэвіч, С. Г. Белаконька, А. К. Белашова, Н. Р. Бельская, І. Н. Булойчык, Ф. С. Бусел, Н. А. Быкоўская, В. У. Бялаева, Н. Д. Бярэжкін, Л. П. Ваньковіч, Я. Н. Варонін, Дз. Я. Верам'юк, С. Л. Вестэрман, Я. І. Вігура, З. А. Вінаградава, Г. А. Вішнеўская, К. В. Волкава, А. С. Гайдаш, І. А. Грабцэвіч, А. А. Гуцько, Ю. Э. Дабражынецкая, К. С. Дабрынская, А. Я. Джажорэ, І. К. Дзікавіч, А. І. Дробыш, А. С. Елісеенка, А. Ф. Ерафееў, А. В. Ждановіч, А. В. Жукава, Е. Ф. Жыгач, В. П. Зайцава, Г. В. Зайцава, А. І. Зайцаў, Н. К. Захарава, В. А. Захарошка, В. М. Зелянкевіч, Л. Ф. Знаменская, Дз. П. Івашка, Я. Н. Івашкова, К. Дз. Ігнацьеў, Г. М. Ісаева, Н. І. Ішчанка, М. А. Кавалёва, І. М. Казак, А. Р. Каласоўская, Дз. А. Карлоўскі, В. А. Карпінская, В. І. Касабуцкая, А. Ф. Качан, В. А. Кашыцкі, І. Дз. Кірэй, Г. П. Клейнава, А. Ш. Клябанаў, Ю. А. Краснова, С. П. Кузьма, К. Х. Кузьміцкая, П. П. Кучаравенкаў, М. П. Ладэс, В. Р. Ланіцкі, Ю. А. Лявоненка, К. Ф. Лявонцьева, Н. У. Ліпская, Я. П. Лосева, А. Р. Лукіна, К. С. Лукоўнікава, А. І. Ляшкевіч, П. Р. Мазалаў, В. П. Мароцкая, А. Ф. Мацкевіч, А. М. Меркуль, М. В. Мілава, М. П. Молчан, Т. І. Мурашка, М. М. Мядзведзева, Н. М. Мялкоў-

ская, М. І. Ніжніценка, С. С. Ніжніціна, В. Я. Новікава, К. А. Новікава, С. Р. Новікаў, А. М. Падбярэзная, Н. В. Палікарповіч, І. І. Праліска, Н. У. Пратасевіч, В. А. Прачук, Г. В. Пуплякава, П. А. Пцічкіна, М. І. Пяткевіч, Н. Л. Рабчанка, З. В. Развмыслова, З. І. Раманенка, Р. К. Рамановіч, С. Ф. Рубанаў, Г. А. Рудза, М. А. Рудкоўская, Л. А. Ружанцава, Е. І. Садкоўскі, А. П. Саковіч, В. І. Сераліна, Н. І. Случаноўская, Ю. В. Смаршкова, Г. К. Сталовіч, А. М. Субоціна, В. Т. Сцепаненка, К. П. Сцяпанава, А. І. Сычова, А. А. Сяргейчык, П. В. Тур, П. Р. Тышкевіч, Н. Я. Уласава, У. П. Фомчанка, М. Е. Францішаў, У. В. Фурсаў, М. А. Хадасевіч, Л. І. Хвалько, К. П. Цітавец, Н. Н. Шарай, М. П. Шаўчук, Н. М. Шляпіна, Г. С. Шумейка, М. Н. Шчэрбава, Н. В. Чарненкава, А. С. Якубчык.

1958. В. П. Александроўская, К. М. Астахава, А. Г. Атрошчанка, І. Ф. Бабковіч, Е. Е. Бабыр, А. В. Багамазава, Т. А. Балабаеў, Д. В. Баршчоўская, М. С. Бахаўчук, Н. С. Бейзарава, Г. Ц. Гардзей, В. Р. Дубровіна, К. С. Кавалёнак, Н. Е. Кацько, М. М. Крукоўская, Ф. К. Лагацкая, Л. М. Нікалаева, Г. І. Рэут, К. Ц. Садоўская, Р. В. Сазоненка, Н. Я. Саковіч, А. Ц. Сарокіна, А. Ф. Сасноўскі, А. І. Страпчанка, В. Л. Філютовіч, К. А. Шабека.

1959. М. Е. Арцем'ева, Н. А. Арол, У. І. Баран, І. В. Барсукоў, В. І. Берэін, К. С. Бялова, І. К. Галіноўскі, Л. П. Гарбацкая, Н. А. Гарнакова, Л. В. Гітковіч, У. Дз. Грышановіч, М. П. Дарафеенка, М. Ф. Драбушэвіч, М. П. Дылёнак, І. І. Запрудскі, А. І. Зяновіч, М. У. Івашын, П. С. Кіслёў, С. А. Крэмез, Л. І. Лешына, К. С. Несцяровіч, М. С. Няроўскі, З. М. Пакроўская, А. А. Парабковіч, Дз. С. Прыхожы, Я. Л. Ржавуская, К. Л. Старынская, Л. А. Талкачова, Ф. Я. Таран, М. Я. Францэвіч, І. Н. Храмцоў, М. Г. Цыбульская, М. А. Цыманоўіч, К. А. Шкляроўская, М. В. Шляхота, Т. А. Шпакоўская, Г. А. Шчэмелеў.

1960. В. І. Адамовіч, Я. Ф. Анціпенка, Л. А. Асташкевіч, М. М. Аўчыннікава, Н. Л. Бабкова, М. П. Багамазава, Н. П. Бальшакова, Ф. М. Батуровіч, В. Л. Белкіна, М. І. Беціна, Е. В. Брусава, В. І. Буры, І. Д. Буяк, І. У. Бяляўскі, Н. У. Валькова, А. С. Васілеўская, В. М. Васільева, Ф. І. Велічкевіч, Н. Л. Вільтоўская, Т. С. Віткіна, Г. В. Волкава, Х. Я. Генкіна, В. І. Гіргель, Т. П. Гладкая, М. С. Грушэвіч, Н. В. Грыбко, М. Л. Грынкевіч, С. П. Гурын, С. П. Гурыновіч, Ф. М. Гуткоўскі, М. І. Додалева, Е. П. Дайнека, А. П. Драчылоўская, Г. П. Жук, В. Л. Жукоўская, В. В. Замыка, Я. І. Злотнік, А. А. Зюзіна, М. Я. Іванчыкава, Д. А. Казлоўская, М. І. Казлоўская, Н. К. Калантаева, К. І. Кандратовіч, А. П. Каралёў, Г. І. Карпюк, Н. І. Кевіш, Я. А. Кернажыцкая, В. І. Кляўз, А. А. Корбут, К. А. Корзун, А. Л. Крэз, Л. М. Кузняцоў, Н. С. Кузняцова, А. К. Кулініч, А. М. Куляшова, З. П. Лапата, М. І. Ліхач, М. П. Лучына, М. А. Любанская, В. І. Лысакова, П. М. Лычкоўскі, Н. А. Мажайка, А. А. Майсейкава, П. І. Малаток, Г. К. Мальцава, С. В. Маськo, В. І. Матросава, Г. І. Мацвеенка, М. П. Машкоўская, В. І. Мельнікава, Н. Н. Моніч, В. Ц. Мядзведская, Т. М. Назарава, М. У. Назарэнка, Г. І. Назіна, Е. М. Небрадоўская, Э. М. Некрашэвіч, В. В. Нікольская, М. П. Ніценка, В. Я. Озераў, М. Г. Осіпава, М. В. Полаў, А. Ф. Палішына, І. Ф. Палтарацкі, А. П. Панамарова, Я. В. Попала, Л. Дз. Папова, Л. Ф. Парфёнава, А. В. Паўлава, Л. Я. Паўлюшчанка, А. І. Перагуд, М. П. Пусоўскі, А. У. Пятровіч, Г. К. Пятровіч, Н. С. Пятрэня, В. Я. Раманоўская, К. Ф. Рамашкова, А. І. Рачок, В. М. Рудая, А. В. Рыбская, А. І. Садоўская, Л. Г. Сакалова, В. А. Саўчанка, В. М. Семчанка, К. П. Славецкая, Н. Дз. Станкевіч, Г. Р. Ставер, В. В. Суша, С. Я. Сычоўская, С. І. Сяргееў, Х. Д. Тайманава, К. М. Туцкі, Л. П. Урагова, Ф. М. Уронская, П. М. Усцінаў, В. М. Храмовіч, В. А. Чувасава, М. Я. Шавельдзіна, Л. Е. Шаўлоўская, А. А. Шафарэнка, С. Д. Шмакава, Л. М. Шыкіравая, З. Г. Шынгель, Г. С. Шылянок, Э. А. Юшкевіч, М. В. Ядроўскал, Н. І. Язерская, Я. Н. Ярмоленка, В. С. Ярэміна.

1961. І. С. Салдаценкаў, Л. І. Чыстоўскі.

1963. П. Л. Аленскі, Я. Ф. Анціпенка, Г. С. Аплячук, Л. Ю. Бань, Р. Р. Барысава, К. Л. Башаркіна, Ю. Н. Борда, А. А. Булат, К. Ц. Бялова,

Я. А. Бярэзіна, С. М. Валодзін, І. М. Вашчыла, Н. Я. Ганчарова, К. П. Гарбялёва, М. Т. Глушэня, Г. А. Громава, В. А. Гудзень, М. М. Дуніч, І. А. Ерафеенка, Р. І. Еўдакімчык, Г. А. Зарыцкавіч, Л. І. Зімацкая, К. С. Зіньковіч, Я. В. Забалацкава, В. Р. Іванова, В. К. Івашкевіч, В. В. Ігнатлаў, М. П. Ільінец, П. Ф. Ільюкевіч, В. І. Камбаданенка, Г. П. Каслякова, Ф. У. Кец, М. К. Князева, М. В. Коласава, І. Ф. Крук, У. І. Кудзевіч, А. С. Кудраўцава, В. І. Кулікоўская, Р. Ц. Кудзішова, М. М. Курловіч, Н. Г. Літвінава, М. А. Лісава, М. Ф. Лосеў, Н. І. Лысенка, Л. У. Ляшкевіч, Я. І. Маеўская, Ц. М. Меднік, А. І. Мілеўскі, А. Н. Мінкова, В. С. Міранoвіч, А. А. Міткевіч, А. В. Міхайлава, І. М. Мурзаў, Н. Я. Набярэжнева, П. Н. Несцярэнка, В. Я. Пагужальская, М. І. Пасюцін, Н. С. Пашэвіч, К. Ф. Пшонка, І. М. Пярэдня, А. І. Рамашова, А. Я. Рашэцька, І. С. Русака, М. М. Седранок, В. Дз. Семачкін, А. Р. Сеннеп, Т. М. Сінельнікава, Л. П. Слепакурава, Н. Ф. Смірнова, М. А. Сталяроў, М. С. Старасціна, З. І. Студнева, Е. М. Сцепаненка, А. К. Тарайкоўская, Ф. В. Фёдараў, А. С. Чабан, В. Я. Чарнова, Н. І. Чэчыкава, Н. Я. Цікунова, Н. Л. Шаўрукова, Л. А. Штукар, Н. А. Шумілоўская, М. Ф. Шупейка, Р. І. Элькінд, М. Р. Юдава, Л. І. Язвінская.

1964. Н. Е. Агароднікава, А. С. Адамчык, М. Я. Аляшкевіч, Н. Я. Андрэева, В. Л. Андрэічкава, М. М. Араўэй, А. З. Арэшка, М. І. Базылёнак, М. К. Балвановіч, Н. А. Баніцырава, М. М. Барэвіч, З. А. Баўбель, М. М. Бачыла, С. А. Белік, М. Я. Белянкоў, М. В. Віскін, З. З. Бокдзіран, В. І. Брэцкая, І. А. Букрэеў, Л. М. Быстрыцкі, М. У. Вяспалава, М. І. Валасевіч, М. І. Варанкін, Л. Я. Васільева, В. К. Вернікоўская, І. Л. Гайкінаў, В. П. Галавашына, В. С. Ганчарова, М. П. Гаранін, М. К. Гарбаценка, В. В. Гарбачова, Г. І. Генералава, Н. І. Грашнова, В. Ф. Грашчанка, Н. П. Гусінцава, К. П. Давідчык, Л. Дз. Дамаранкал, М. С. Данілевіч, М. А. Дзмітрыеў, Н. А. Еўдакімчанка, І. В. Жук, З. Г. Жукоўская, К. П. Журкова, Л. І. Жыліна, М. М. Зарэцкі, Л. П. Звонак, С. М. Зубоўскі, Н. Дз. Зуева, Н. К. Зязюлін, М. Ф. Ільюшэнка, М. А. Кавальчук, Р. П. Калінарава, Г. Е. Казлова, В. І. Каленік, С. І. Калугін, Л. Ф. Камароўскі, В. А. Кандрацьеў, Н. Ф. Капцюк, М. А. Картузаў, В. С. Карцель, Т. І. Касцюкевіч, А. С. Кецко, Г. А. Кір'янава, В. Дз. Кляменцевіч, В. Е. Клімовіч, Т. Ф. Корж, Ф. Л. Крайкін, А. М. Красціна, М. М. Кудраўцава, В. П. Кузуртза, Г. І. Кунцэвіч, Г. А. Лабанок, Т. П. Лазарава, Л. І. Лайко, А. Т. Лебедзева, Н. М. Лебедзева, І. І. Луцаеў, Л. М. Любімцава, М. Ц. Макеева, Л. П. Малахава, В. Ф. Малышава, М. М. Манькоў, М. М. Марцінкевіч, М. М. Маторына, С. К. Міронавіч, А. Р. Міхалёнак, С. І. Мялешка, В. У. Навуменка, Н. А. Навуменка, А. М. Несцярук, В. І. Ніжфаровіч, В. М. Нікалаеня, Е. Дз. Новік, З. Н. Носава, В. Л. Няхрасаў, М. М. Няпрэскі, В. Е. Паўлава, К. П. Паўлава, Л. Я. Паўлаў, З. П. Петрачкоў, Г. А. Платонава, І. Ф. Пратасевіч, А. С. Пушкін, Т. В. Пушная, В. К. Ражджественская, В. В. Ражкова, Л. Ф. Разгуляеў, В. І. Расінскі, В. І. Рузава, М. С. Рынкевіч, В. В. Рэгель, У. В. Савельеў, Р. М. Санкін, Р. У. Салаўёва, Р. І. Салдаценка, С. Д. Самушэў, В. Ф. Самцэвіч, М. Р. Семянена, С. Ф. Серэна, М. М. Сівакова, Т. Р. Сідарчык, А. М. Скавародзіна, С. Т. Смялоўская, Н. Дз. Сокалава, Н. М. Сокалова, Н. А. Сосна, К. І. Стаброўскал, Г. С. Стукалава, Л. Р. Суворава, М. М. Супічэнка, В. У. Сухачэў, А. Я. Сцефаненка, М. М. Сліжкевіч, М. І. Талейка, М. С. Талочка, Н. С. Талстая, І. Р. Тупіцын, Д. П. Уласава, Р. І. Ушакова, П. І. Фядоценка, Г. П. Хадкевіч, В. М. Хіль, В. Р. Цабкала, І. М. Цітарэнка, Н. Е. Ціханава, В. А. Чанцава, А. М. Чарнякоў, Б. Я. Чорнабародава, В. Г. Чысцякова, С. П. Чэчка, М. М. Шайкоўскі, А. І. Шкурдюк, Л. Я. Шляхціна, К. А. Шот-Чатовіч, В. В. Шумейка, К. Т. Шышкевіч, Н. А. Юркавец, В. А. Якушава.

1965. Н. М. Агалец, Д. К. Анісімава, А. І. Бабановіч, В. І. Архіпаў, М. І. Аўраменка, А. І. Балаболіна, Ф. У. Багдановіч, А. М. Барысенка, В. М. Баліна, Е. І. Банчук, Н. Н. Барысава, А. М. Барысенка, І. Д. Бельская, І. А. Берэзінская, Д. Ц. Бірулёў, Н. Н. Бірыч, Я. В. Бродскі, В. Р. Вязмозгал, П. Ф. Вялік, М. В. Бярэзіна, В. І. Вайцянкова, А. Ф. Валюкевіч, Н. Н. Вараб'ёва,

Н. А. Верамейчык, Е. І. Вішнеўская, К. І. Воранава, Г. А. Вырадаў, А. В. Галкіна, У. А. Гардусенка, П. М. Гарэлікаў, К. І. Геаргберыдзе, Р. С. Гінзбург, У. А. Глінскі, В. М. Голубеў, К. Л. Грабайла, Л. Ф. Грынчук, Ц. А. Грычанок, А. Ф. Гудоўская, А. С. Гулевіч, І. Ф. Гуркоў, І. С. Данілаў, П. А. Данюк, Е. С. Дзенісюк, Я. П. Дзіканава, В. Дз. Дзмітрыеў, Х. А. Драбкіна, Г. І. Жураўская, М. І. Забродзіна, Н. К. Залужная, І. І. Захарэнка, Я. А. Зінкевіч, Е. Д. Іваніцкая, Г. І. Іваноўская, В. В. Іванюк, Т. С. Ігнаценка, Г. С. Кавалёва, У. А. Казакевіч, А. І. Казей, І. С. Казлоў, Л. С. Казлоў, М. А. Кайрыш, С. В. Калачык, А. С. Калеснікава, М. М. Калістратаў, М. М. Калкоўскі, А. В. Качкоў, К. М. Кіявіцкая, С. П. Класоўская, В. Р. Ключынская, Я. В. Клінаўская, Т. М. Краўцова, А. А. Круцько, С. І. Ксензоў, Г. М. Курдо, В. В. Кузьмін, М. І. Кузьміна, М. П. Куцапалава, Т. А. Лазарава, М. Я. Лазук, В. Ф. Ларыёнава, К. С. Лісоўская, П. Г. Ліхачоў, Н. М. Лугавая, Р. М. Лук'янчык, А. А. Мазанік, Г. А. Майсеева, Я. П. Малюгіна, В. П. Маркаў, А. А. Мароз, Л. А. Мартыненка, І. Ф. Марціновіч, В. І. Мацеёўская, Г. С. Мельнік, К. І. Мельнікава, Н. Х. Міхальчук, З. У. Мурашка, М. В. Мурашка, Г. І. Мусакоў, Е. С. Мядзведзева, А. І. Мякішкова, В. С. Мяцеліца, К. Ф. Мяшкоўская, А. П. Некрашэвіч, М. Д. Некрашэвіч, І. А. Нікіфарава, Л. Дз. Ніцеўская, Н. С. Новікава, М. С. Орсіч, П. Я. Пагрыбной, С. С. Палейка, В. І. Палянскоў, М. А. Панцырэў, У. А. Парахневіч, А. І. Пасько, Г. П. Перапёлава, М. Ф. Петрыкевіч, А. І. Прадзедава, Е. М. Прохарава, В. Р. Прохарык, Я. І. Пушкарова, А. І. Ржэўская, М. Р. Рыбак, М. Ц. Рыжанкова, В. С. Рымдзёнак, Ф. С. Савік, А. М. Савошчык, Р. Ф. Самойлаў, Г. Ф. Сініцына, А. Ф. Сіраньков, Л. І. Сіткевіч, Б. Ф. Сіўко, Г. А. Смірнова, Г. А. Сташэўская, М. Д. Сукачова, Л. П. Сухадольская, Л. Н. Сліжкевіч, А. Ф. Трафімаў, М. У. Трыпуцін, К. С. Тышкевіч, Ф. М. Ус, Б. Д. Фалкіна, Р. Ц. Фугіна, К. А. Харкевіч, А. К. Цабкала, У. Ц. Цабо, І. Я. Цімашкоў, З. І. Чарапкоў, І. Н. Чаркасава, М. М. Шабурава, Л. М. Шапіра, Г. П. Шарай, А. А. Шаўчук, І. К. Шашэнька, А. П. Шнейдэр, Н. П. Шэмет, А. А. Эмінава, Г. М. Юхнавец, А. М. Якаўлева, С. С. Якаўлеў, К. В. Якімовіч, М. І. Якімюк, Я. Дз. Янчанка, В. Ф. Ясінская, Я. Ф. Ясноўскі, А. П. Яфрэменка.

1966. А. А. Абрамовіч, А. Р. Адзінец, Дз. С. Акімава, Р. П. Акуліч, В. П. Аленькава, В. А. Алешын, Л. І. Анжыеўская, І. А. Апанасевіч, М. Р. Арлова, Ф. Ф. Аскерка, А. В. Асмалоўскі, У. Т. Аўсеенкаў, Л. Ф. Афанасьева, М. І. Ачкін, А. І. Бабкоў, В. М. Балашова, А. С. Бандарэнка, В. І. Бараноўскі, В. С. Барысава, В. І. Барысавец, Т. Р. Белякова, В. Х. Берлін, П. А. Берташ, А. Р. Будзіловіч, З. С. Буракова, Н. І. Быкава, А. В. Валчок, Н. К. Валчок, В. Э. Варатынская, В. І. Васілеўская, І. Р. Васільева, В. Т. Васкавец, А. М. Вішнічак, В. І. Воранава, В. І. Вярсоцкі, А. П. Гавароўская, Э. А. Гакава, З. С. Галаніна, А. М. Галкін, К. В. Гарбачова, І. С. Гаруноў, П. К. Гарэлікава, П. С. Гершан, Г. А. Глуздакова, В. С. Грачыха, М. С. Грынцэвіч, Г. І. Грышына, М. П. Гулевіч, М. М. Гуль, С. Р. Гушча, У. Ф. Далжанкоў, М. Г. Даманцэвіч, Э. М. Дамінікевіч, Е. Г. Дарафеева, У. А. Дарашук, Ю. І. Джасава, Л. П. Дземідовіч, П. Ц. Дзівакоў, К. В. Дзмітрыева, А. М. Дзмітрыеў, Э. М. Дзялілава, А. А. Дзядзюля, Ц. Ф. Дзяніскаў, В. П. Драздоўская, К. І. Дунец, Д. В. Ерамеева, Л. Р. Ерафеева, В. І. Жадзейка, В. Ю. Жалкоўскі, В. І. Жарская, В. А. Жорава, М. І. Жураўская, В. Г. Жываглод, Н. І. Жыгмунт, Г. С. Забалотная, Н. М. Зантовіч, В. М. Зікунова, А. В. Зубец, Н. Т. Зуева, В. Я. Ігнатовіч, Н. А. Ігнатовіч, Т. А. Ільінская, М. М. Іоначкіна, В. Н. Ісаеві, А. П. Ісаенка, М. Я. Кавалеўскі, М. П. Казакоў, С. Р. Казачонак, В. В. Канавальчык, А. Р. Кандратовіч, К. А. Канцавой, М. Д. Капелёвіч, І. М. Капітан, М. Ф. Капскі, С. І. Карпечкін, Л. У. Кармалітава, Ю. І. Касабуцкая, С. П. Каткоў, З. С. Качароўская, А. М. Качыпскі, Я. І. Кашалёва, П. Р. Квашніна, Т. А. Кляпацкая, Н. І. Кобрына, А. М. Колас, М. П. Краўцова, Г. У. Краўчанка, В. А. Кротава, В. Л. Крушаніцкая, З. А. Кубіцкая, І. М. Кузін, Н. П. Кузіна, І. М. Кузьміч, В. М. Кузьміна, Н. С. Кузьмянок, Т. А. Кузнечык, К. А. Кукушкіна, В. Я. Кулакова, М. В. Курдо, У. Я. Курловіч, А. Ц. Курылін, Г. Я. Кутневіч, Л. С. Лабус, М. І. Лавер, М. М. Лаоўская, В. І. Лаленка, Г. М. Лапо, Т. А. Лапчынская, М. Ф. Ларыёнава, Г. Ф. Лашкова, М. Ф. Левановіч, В. С. Леўчанкава, Н. І. Ліпская, Н. І. Логінава, І. М. Лукашык, П. Ф. Лук'янскі, Е. В. Ляцко, Я. Л. Макееў, Я. Ф. Максімёнка, І. В. Малец, С. П. Малішэўскі, В. І. Малюк, Н. М. Манеўская, М. А. Маніс, Я. Г. Марцінкевіч, Г. М. Марчанка, З. І. Марчанка, Л. П. Масальскі, Я. Р. Маткоўская, В. І. Матус, М. А. Махачкеева, А. П. Мельнікава, М. А. Мельнікаў, К. М. Міхрукова, Л. У. Мілей, С. А. Мілун, М. А. Мінюк, С. Я. Міронаў, Дз. С. Мішкуёнак, І. А. Музычкін, Е. С. Мляжэніс, В. С. Навагран, В. Р. Навумаў, А. С. Налягач, Н. П. Новік, С. П. Нярэціна, К. В. Падольскі, Л. М. Пазнякоў, Н. В. Пакроўская, Е. П. Палоўнікава, М. І. Палтарацкая, Т. Ф. Палхоўская, С. Г. Папова, В. А. Пяташкоў, Н. Да. Паўлава, З. С. Пачкаева, І. І. Пашкоўская, Я. В. Перавозная, П. С. Пехцяроў, А. І. Печкурэнка, С. А. Піскунова, Н. Г. Пляханава, У. Ф. Праневіч, М. І. Пырачкін, М. М. Пятрэнка, Ф. С. Рабічка, В. Я. Раманава, Р. М. Раманенка, Г. Х. Раманькова, Р. Ф. Растаргуеў, В. Р. Рашкевіч, В. І. Рымашэўская, М. Л. Рэлес, Л. М. Садоўская, М. Н. Саковіч, М. Г. Сарагавец, В. В. Секержыцкая, В. І. Семяновіч, М. А. Семяняка, Г. М. Серабракова, М. С. Серада, А. М. Сеўба, І. У. Сівак, А. В. Сімакоў, В. М. Скотнікава, К. М. Скробаў, С. Г. Славінская, Т. В. Славінская, І. І. Смарыга, Г. М. Сопель, М. М. Станкевіч, І. А. Станілевіч, М. П. Старыковіч, А. Дз. Страўе, М. Ц. Стэльмах, Л. В. Суле, Г. С. Сухадолец, М. Ф. Сцепанькова, К. М. Сцёпін, А. В. Сялюгін, Т. А. Тарасевіч, А. Я. Точын, Л. М. Троцкая, Р. М. Туравец, З. І. Удальцова, А. В. Уласава, Г. І. Усольцава, М. А. Фалейчык, М. М. Федасенка, З. Л. Фенчанка, М. К. Фешчанка, І. М. Фёдараў, Г. П. Філіпава, У. І. Філіпенка, А. П. Фінскі, М. І. Хадаронак, С. Р. Халлўка, А. А. Хандожка, С. М. Хацьянаў, Л. В. Цімаховіч, Г. Е. Ціханава, М. Н. Цыбірова, К. В. Цыбулька, М. С. Цяслюк, С. Р. Чакмарова, Л. П. Чартkова, В. Да. Шавялёва, П. І. Шадурын, А. Дз. Шайтар, Е. М. Шамшурава, М. А. Шамкавяк, А. П. Шапікава, П. А. Шыбаева, А. П. Шышонак, Н. І. Юрцэвіч, В. С. Юферава, В. В. Явіпскі, Л. В. Якаўлева, Г. Дз. Яроміна, Д. В. Яфрэмава, Р. М. Яфрэменка.

1967. П. Н. Абушкевіч, В. С. Агароднік, Т. П. Адамовіч, Г. П. Адамчык, Н. Ф. Азарава, М. Б. Аксельрод, А. І. Акуліч, Г. П. Аленса, З. І. Альхімовіч, А. М. Аляксееў, В. Ф. Амплейкін, Т. А. Андрэева, А. С. Анісімава, К. П. Антонава, Г. Л. Арлоўская, Л. І. Арлоўская, Н. Ф. Асінская, Л. Л. Асоўская, Л. Н. Астафурава, М. Р. Атрашонак, Н. В. Аўраменка, П. М. Багадзіж, Я. Е. Багатырова, А. І. Базылевіч, В. В. Бакунова, В. Ц. Баранава, Т. І. Барсток, А. С. Барысенка, В. І. Барысовіч, А. П. Берасцевіч, В. З. Бодніч, Г. П. Борхан, Ф. І. Браноўская, В. К. Брыкін, Л. І. Буйневіч, М. І. Булан, І. М. Бурдзіна, Дз. С. Бяклемішаў, В. А. Бяліцкі, К. Л. Ваньковіч, К. С. Вараб'ёва, А. П. Васільеў, Г. А. Верамейчык, К. А. Вінтароўскі, Віяна Гомес дэ фонсеа Харарда, Г. Ф. Воранава, І. М. Воюш, В. Р. Вялічка, Ф. А. Вярцінскі, М. В. Вяршкова, Э. С. Вярыга, К. П. Вятрова, Т. Ц. Гагалінская, Л. П. Гажэнка, Р. Р. Ганжураў, З. В. Гарадзецкая, Л. А. Гарадзецкая, Н. П. Гарбачова, Л. Г. Гарбузава, З. І. Гардзейка, М. К. Гардзіенка, Е. А. Гарнізонава, В. В. Гарох, Я. В. Гарэцкая, В. Р. Гатальскі, І. Г. Гаўрылаў, М. М. Генкіна, В. С. Герасіменка, Л. Дз. Герасімовіч, У. А. Германовіч, К. С. Главінская, З. А. Гладоўскі, У. І. Гляцэвіч, Л. А. Гніларыбава, М. Н. Горбач, Б. З. Гордзін, А. П. Грамыка, Л. А. Грахоўская, Т. П. Грысюк, М. М. Грыцкевіч, А. М. Грышкіна, М. Я. Гузман, П. А. Гулько, А. Р. Давыдзько, Г. І. Дайнека, Л. В. Дайнека, Г. А. Далецкая, А. А. Дамарацкі, І. П. Дзегялевіч, Р. П. Дзяйкун, Л. І. Дзялендзік, І. П. Дзямідаў, М. І. Драека, Ц. В. Дражын, Л. А. Драздова, С. П. Драгоўскі, Г. І. Дуранкова, Ц. Р. Евельсон, Г. М. Емельянава, М. А. Еўдакімаў, І. М. Жарыкаў, В. Г. Жук, У. С. Жук, Н. Я. Жукава, Н. А. Жыгарова, К. Ф. Жыгунова, А. Г. Жыткевіч, Г. Д. Зарачанская, С. М. Затопенка, М. П. Зыль, К. А. Іванова, Н. Т. Іванова, Р. М. Іванова, Л. Дз. Іванькова, В. Дз. Івашына, З. А. Іонкіна, К. Р. Іўковіч, А. В. Каваленка, Н. П. Кавалёва, Т. Л. Кавалёва,

В. З. Кавалёў, Р. В. Кадзін, В. У. Кадышаў, У. К. Казакова, К. М. Казьміна, П. Я. Каленчыц, В. А. Калінава, Н. А. Камарова, Н. В. Камарова, Ф. А. Камарова, В. П. Камароўская, Я. С. Кананюк, М. А. Капусціна, К. А. Каратай, І. В. Карнееў, А. П. Каршуноў, Н. А. Касабуцкая, А. А. Касабуцкі, Н. Ф. Катлярова, М. І. Кірылаў, Ф. С. Кісялёва, С. А. Клокаў, Г. Н. Кленча, П. В. Конанава, І. А. Корбан, М. А. Корнева, Н. Я. Коцікава, М. М. Красненкаў, В. А. Красуцкая, М. С. Круцікаў, Н. С. Круцько, А. М. Куаняцоў, М. А. Кулагіна, В. П. Кулай, А. П. Курганскі, К. А. Кухарэнка, Н. І. Лабанава, Ф. К. Лагутаў, Н. М. Ламакіна, К. Г. Ламшэўская, Н. А. Лаўрэнава, М. А. Лебедзеў, У. А. Лебедзеў, Н. І. Левін, С. І. Леўчык, А. А. Лешчына, Л. Ц. Ліхачэўская, Г. М. Лугаўцова, М. І. Лунь, Л. І. Любецкая, Л. У. Лютко, А. А. Мазалэка, З. В. Макрыца, М. І. Максіменка, К. С. Малахава, М. В. Малышава, А. І. Маркаў, С. Р. Маркевіч, І. І. Мароз, М. М. Мартынаў, Н. В. Маскалёва, А. М. Маталыцкі, А. А. Мельнікава, Г. Р. Мельнікава, В. Да. Мельнікаў, М. К. Мерабішвілі, Р. С. Мінчанка, М. М. Мірончык, М. В. Мірыцкі, С. В. Міслюк, В. В. Мурашка, В. У. Мурашка, Н. А. Мяшкова, Г. І. Набокіна, М. В. Навіцкая, Г. А. Немагай, А. Л. Новікава, В. К. Новікава, А. Да. Нядзведская, А. Ф. Нячаеў, М. Г. Обстрах, Г. І. Осіпава, Л. І. Пакаташкін, Н. В. Палавінка, Я. А. Палішчук, В. А. Панамарова, М. І. Панасюк, В. С. Панцялеева, З. Ф. Паўлоўская, Т. П. Паплаўская, І. І. Папоў, П. С. Патапейка, М. П. Пацёмкіна, І. Я. Петраш, А. А. Пігулеўскі, Н. А. Платко, Л. П. Пракоф'ева, С. І. Праўко, М. Р. Прывалава, В. М. Прышчэпчык, Л. В. Прэйс, П. П. Пукала, У. І. Пуцееў, М. В. Пушкарова, У. А. Пятроўскі, В. Я. Пячаткіна, І. М. Равуцкі, Л. Да. Раманенка, Э. А. Рапапорт, А. І. Ратковіч, А. Ц. Русакоў, Е. Ф. Савельева, Н. А. Савіцкая, Р. І. Садкоўская, Н. Д. Сазонава, У. Да. Салавей, А. І. Салаўёва, Ф. П. Сапроненка, А. М. Сасноўская, Л. В. Сасноўская, У. М. Саўко, П. П. Сачыўка, М. Я. Свірыдзенка, Ц. Т. Свістуноў, М. С. Селіверстава, М. У. Семак, Ф. І. Семчанка, М. А. Семянкова, А. М. Семяновіч, Г. У. Сіліч, Н. А. Сілкіна, П. П. Сінякевіч, Ю. А. Скваркоўская, Л. І. Скварцова, Т. В. Скібіцкі, Л. І. Скокава, В. М. Станкевіч, А. Ф. Старавойтава, В. П. Старавойтаў, Н. Г. Строк, Н. І. Суворава, Л. А. Сцефаненка, А. І. Сцешыц, В. С. Сцяпанава, Г. Ц. Сцяпук, Г. А. Сяльскова, А. С. Сямашка, Г. М. Таганоўіч, В. М. Такарэўская, Н. М. Тамарава, Т. П. Тамашэвіч, В. В. Таранчук, В. А. Тарасевіч, П. Я. Тараненка, У. І. Трафіменкаў, Г. І. Трубская, Н. М. Тужыкава, Г. В. Тумашкова, Ц. І. Туніца, П. Да. Урублеўскі, В. П. Ускоў, В. А. Усціменка, А. П. Ушкалава, З. І. Філімоненка, Г. М. Філіпава, І. Г. Фясенка, Л. В. Хіжынская, М. Л. Ходар, К. Ф. Целюкова, Л. М. Цітко, М. М. Цітова, М. П. Ціцік, А. П. Цыхун, Ю. А. Цярэня, В. М. Чабатаронак, Б. У. Чабоцька, А. П. Чакліна, Е. С. Чарнова, А. Ф. Чарнякова, М. А. Чорная, Г. І. Шавель, І. Г. Шадур, С. А. Шалак, Н. П. Шалонік, Т. М. Шалюта, Р. І. Шамко, В. В. Шапялевіч, Я. В. Шарыпава, П. Р. Шастакоў, Л. В. Шахленова, Н. І. Шматкова, В. П. Шульга, М. М. Шумаў, М. С. Шумская, В. В. Шчасная, М. П. Шыпінская, Н. А. Шыфрына, З. К. Шышова, В. П. Эгліт, А. У. Юдашкіна, М. П. Юдзеніч, З. Ц. Юдзянкоў, Я. І. Юралайц, З. А. Язерская, Н. Ф. Якаўлева, Ц. С. Ялычык, Е. І. Янушкевіч, Н. А. Яроміна, Я. Р. Ярэц, В. А. Яўнайс, М. І. Яфімава, Р. С. Яфрэмава, Ю. М. Яшчак.

1968. І. І. Абрамовіч, Е. Ф. Авярковіч, Т. С. Агеенка, А. С. Агінская, П. Д. Адаіцоў, К. С. Акачонак, Т. М. Аляксеенка, Н. Е. Амбразевіч, Ц. Ц. Андрэеў, К. М. Андраюк, Ж. І. Андрушкевіч, Л. Г. Андрухіна, А. Ф. Антончык, Н. В. Апанскал, І. Л. Архіпенка, З. Я. Арцем'ева, Я. П. Арэнтаў, П. А. Астапенка, Н. Д. Асюлева, В. І. Аўрукко, М. Н. Бакатанава, Н. М. Балвановіч, Н. А. Баравая, Н. В. Баранава, І. М. Барановіч, К. І. Бараноўская, М. С. Бароўскі, А. І. Барысевіч, А. І. Барэйка, Да. Х. Батрова, В. Я. Баханькоў, Е. А. Бахарава, Г. В. Бежалёва, Р. Р. Бейнензон, Л. П. Бекерава, Н. М. Белайчук, В. В. Белая, В. А. Беланурская, С. М. Белы, У. І. Белы, М. П. Бельскі, А. П. Берасцнёў, І. В. Бешанцаў, М. С. Вліпкова, З. А. Бондар, І. Р. Бочко, З. І. Бранавец, Н. С. Бранавіцкая, І. А. Булай, Ф. У. Бубен, Г. Да. Будзікава, А. Г. Бунь, Н. І. Бузо, П. Я. Букніч, М. М. Буланкін, З. І. Булыга, І. П. Булыка, С. С. Бурак, С. В. Бусел, Г. Ю. Бухаўцова, Я. І. Бухцеева, Г. Я. Бучэка, М. Ю. Буцявіцкі, Я. І. Вычкоўская, В. І. Бэлугіна, М. Я. Вяршытэйн, А. Р. Вяспалава, С. Ф. Галатовіч, Т. М. Валадзько, В. А. Валожына, П. І. Валуй, Т. А. Валынец, А. П. Ванаршэнка, В. С. Вараб'ёў, П. К. Варывончык, Ф. Ф. Васілеўскі, В. Э. Васілько, В. Г. Васільеў, У. Я. Васілюк, М. М. Васілоўская, А. П. Васькоўская, А. М. Ваўкова, А. Да. Весялова, В. М. Віннікава, Л. П. Вінаеўскі, І. І. Волкаў, З. В. Вярбіцкая, М. М. Гавацінаў, А. С. Галакціёнава, А. І. Галавешкін, П. Д. Галенчык, С. П. Гарабчанка, К. А. Гарбацэвіч, Л. І. Гарлачова, М. У. Гасцёва, В. А. Гатоўка, Н. П. Гарусейка, Е. П. Гаўрылава, Н. П. Герашчанка, А. І. Гертман, Н. Г. Гетманская, В. В. Гілінскі, Д. Г. Гінзбург, І. Л. Гінсбург, Е. В. Гладкевіч, І. І. Глушцоў, В. Г. Гоева, З. Л. Голубева, М. Да. Гразнова, Г. І. Грыгор'ева, А. А. Грынчык, В. М. Грынчык, І. А. Грыцук, П. Н. Гурко, Т. Ц. Гурская, Д. І. Гурчанка, Н. В. Гурына, Л. С. Гурэвіч, І. С. Гуцеў, Н. А. Дабравольская, А. А. Давідзіч, І. П. Данілевіч, В. З. Данільчык, У. М. Дарафей, В. А. Дарошка, А. М. Дашкоўская, В. М. Дзенісік, Г. К. Дзенчык, З. А. Дзіцяціна, Т. І. Дзядзіловіч, Н. П. Дзяжурка, М. І. Дзякевіч, С. Ц. Дзямешка, Н. І. Драбышэўская, Г. В. Дранцкая, К. Я. Друмілава, Ф. С. Дубінчык, П. М. Дубовік, А. П. Дубоўская, П. А. Дуброўскі, Да. В. Дударай, Н. І. Дуліч, В. А. Дунец, Я. П. Дусь, П. С. Ерамейчык, Ц. А. Ерафеенка, М. А. Елісееў, В. У. Жабуровіч, М. А. Жук, А. С. Жук, А. П. Жукава, Л. А. Жукоўская, М. М. Жукоўскі, З. С. Журавёва, А. П. Забенька, А. І. Задора, І. В. Завадскі, П. М. Зайкін, Е. І. Зайкоўская, Л. Н. Зайчык, Г. С. Зароўская, У. І. Зарэцкі, А. Л. Захарэвіч, Т. І. Заяц, У. А. Зінавенка, К. С. Злобіна, А. Т. Зялёны, В. М. Зяньковіч, Г. А. Іванова, З. К. Іванова, П. М. Іванцоў, В. К. Івашкевіч, І. М. Іваніцкі, Г. І. Ігнацьева, Л. Э. Іофе, Л. А. Іпчына, В. І. Іцянкоў, А. І. Кавалёва, Е. А. Кавальчук, Т. К. Кадрэвіч, А. В. Казлова, Ф. А. Казлоўскі, Л. Р. Кажамякіна, Н. І. Каліноўская, Л. Я. Калініна, С. К. Кальчук, А. К. Каляснь, М. Да. Камарылава, А. П. Кандратовіч, М. М. Кандрацева, У. І. Канецкі, М. Ф. Кандрацкі, Н. А. Канкрэц, Т. А. Канцавая, П. А. Капусціна, М. М. Капусціна, М. К. Каралёва, А. П. Каралькоў, А. Н. Карлкова, С. С. Карачун, Я. Ц. Кардаш, В. А. Кармілна, Г. В. Кароль, М. М. Карпенка, М. Е. Карпуся, П. С. Карэтнікаў, В. Ф. Кастко, М. А. Касцюкевіч, І. П. Касцючэнка, М. І. Каспк, Н. В. Катрэ, М. Т. Кіеня, М. А. Кілачыцкі, Е. М. Кіпнік, А. А. Кісялёў, С. І. Кісялёў, А. С. Козік, Г. І. Банах, М. М. Кончыц, Н. Я. Корсікава, Ш. М. Косцю, М. А. Кравец, Т. І. Крапошына, Л. В. Краўцова, П. В. Краўчанка, І. Г. Краўчанка, Г. Г. Кругавы, А. І. Кругленя, А. Да. Крукоўскі, У. Да. Крукоўскі, Л. Л. Крупская, Я. С. Крываблоцкая, Т. Т. Крылапава, В. М. Крышко, Л. К. Кудрэўцава, К. Ф. Куземенчык, А. Е. Кузняцова, Ф. І. Куксін, Н. Н. Кулакоўская, А. А. Кулікава, Л. Н. Кулакоўская, Т. М. Куліковіч, Г. М. Кунцэвіч, Я. В. Купрыянава, М. Т. Купрыянец, К. Р. Купяршток, В. П. Курасец, Н. І. Курачыцкая, А. П. Курносаў, А. М. Курчэўская, К. Ф. Кухарава, Ф. Да. Кухарава, М. В. Кухараў, Г. П. Кушалеўскі, Р. В. Лагачова, М. А. Ладуцька, І. П. Лавук, І. І. Лакіна, А. Р. Лапанькоў, Н. Ф. Лапіцкая, П. Р. Лапіцкі, Р. І. Лапіцкі, А. М. Лапунова, З. Ф. Латышова, Ф. В. Лаўчынскі, М. В. Лебедзева, Н. С. Лебедзева, І. Ц. Леўкін, М. П. Літвінаў, В. К. Лобач, В. П. Лонь, В. П. Лукашовіч, Г. І. Лылава, Р. С. Ляхавенка, Н. П. Лысуха, Я. С. Лябецкая, А. І. Ляўкі, І. А. Ляўда, І. Ф. Ляўковіч, А. І. Макутоніч, Л. А. Мазгавая, Т. І. Макейчык, Я. І. Малаўко, Е. П. Малаковіч, М. А. Малашук, М. Ф. Маліноўская, А. Л. Мальцаў, А. М. Малышка, П. А. Мараваў, П. А. Мартыненка, І. М. Мартыновіч, У. Ф. Мацінята, М. Г. Мастовіч, М. І. Масальская, Т. П. Матрунчык, К. І. Мачаліна, І. А. Мацкевіч, Л. Ф. Міранковіч, Т. В. Міроненка, Н. В. Місюк, Л. А. Міхаковіч, І. І. Муравіцкі, А. А. Мусцейкіс, А. Б. Мухіна, Г. Р. Навумава, Н. В. Навумава, А. А. Назіна,

В. І. Напрэенка, В. К. Насілоўская, М. С. Нацэвіч, П. П. Несперай, З. А. Нікольская, С. К. Нікуленка, А. Ф. Новік, К. І. Новікава, В. А. Падзвінская, Г. І. Палонская, В. І. Папова, К. Да. Папова, Л. К. Папова, М. М. Папоў, Я. С. Парфенэнка, Г. Ц. Парфёнава, В. Я. Паўлава, Л. М. Паўлоўская, Л. М. Пафнуцьева, П. К. Пацей, Н. С. Пацкевіч, Т. П. Пачынская, К. А. Пекар, Н. А. Петрачэнка, В. П. Піпаварава, Ф. А. Пішчыкава, С. В. Піскун, В. С. Пладуноў, М. М. Плескачоўская, К. Т. Прахарэвіч, Л. І. Прышчэпчык, Л. Ф. Пуранкоў, Э. М. Пяткевіч, А. Д. Пятрова, К. М. Пятровіч, Ю. Ф. Пятроўская, М. М. Пятрухін, Е. І. Рабцава, К. Л. Равінок, А. Н. Радзечка, М. Р. Радзінкова, Л. А. Радзішэўскі, А. А. Радоўская, Г. М. Радзько, Г. М. Разанка, Л. І. Разнюк, Д. Л. Ракашова, Ф. К. Расінскі, З. І. Родзін, Н. М. Роскач, Р. І. Румянцаў, В. С. Русакова, У. Т. Рыжыкаў, М. І. Рыльскі, В. А. Рымашэўскі, В. В. Рытчык, Н. В. Саевіч, Р. П. Сакалова, В. А. Саковіч, С. В. Салагуб, Л. В. Самовіч, Г. М. Саўкіна, Н. Ф. Сачкова, Г. М. Селеванчук, М. Р. Семашкевіч, Г. І. Семянцова, В. П. Сергіена, С. К. Сердзюкоў, К. А. Сідзюк, А. Р. Сімчанка, П. М. Сінічкін, П. П. Сірош, Н. М. Скалабона, В. В. Скалубовіч, М. А. Скуратовіч, К. І. Слабуха, К. Н. Смірнова, В. Ф. Сопатава, І. А. Сотнікаў, П. М. Сотчанка, Я. А. Сошнікава, В. А. Сошына, М. Да. Станеіч, М. І. Старчанка, У. А. Стаскевіч, С. Г. Статкевіч, Т. Л. Стахоўская, А. А. Сташэўскі, У. С. Субоцін, М. М. Сулкоўскі, Н. Я. Сумарокава, А. К. Сураўцова, І. А. Сухарукаў, В. М. Сушкевіч, П. М. Сяргеенка, Ф. І. Сяргееў, М. І. Сятун, У. М. Сяпанаў, І. І. Сысой, Н. В. Талмавава, Р. І. Талюш, М. Я. Талмачоў, Е. А. Тамаева, Л. І. Тамковіч, Е. З. Тараноўская, С. І. Тарасевіч, Г. В. Ткачэнка, А. П. Толсцік, А. М. Трошына, С. Р. Троцкі, М. І. Трусаў, М. П. Тузаў, І. Г. Тупікоў, П. П. Турайкевіч, Ф. А. Турскі, С. І. Трызна, Л. Ф. Украінская, М. І. Унучак, Да. П. Усаў, Н. І. Усікава, З. І. Усовіч, В. С. Фаміна, К. М. Фаміна, В. У. Фомчанка, Ф. П. Фрайман, Г. А. Фядосава, Е. С. Хадарэнка, А. Л. Хашкоўская, Р. І. Хамчонак, Н. Я. Хамлкова, С. М. Ханенка, З. У. Хвір, В. А. Хапалюк, Н. П. Хмурчык, Л. С. Храмцова, А. І. Цалко, Н. Да. Царова, П. П. Ціванюк, Ш. В. Цівес, С. І. Цімошчанка, Г. А. Цітова, В. А. Цітова, В. К. Ціхамірава, С. І. Цішкавец, І. І. Цяртычная, М. П. Цярошка, М. М. Цярэшчанка, Я. А. Чабан, В. К. Чайкоўская, В. Р. Чамаданаў, М. В. Чаркас, М. І. Чарнякоўскі, М. К. Чмыранка, А. Т. Чубкоў, Р. Е. Чэрні, А. М. Чэрнік, В. С. Шабалтас, М. Я. Шабан, Е. Г. Шалак, С. Л. Шакулава, В. Да. Шалуха, Я. К. Шалькевіч, М. П. Шалюта, М. Ц. Шалышка, Г. С. Шапько, Т. В. Шапавалава, І. З. Шапіра, А. П. Шарэц, А. С. Шарыбчанка, М. Л. Шатанава, Р. Ф. Шаўчук, С. С. Шаўчук, Ф. Е. Шашэнька, Л. Н. Шафранаў, І. М. Шведаў, Л. Ф. Шкляр, М. Р. Шкрабава, В. А. Школьнікаў, А. К. Шкутаў, З. А. Шмуратка, В. М. Шлец, Н. А. Шляхценка, В. І. Шніп, А. Ф. Шурупова, І. Г. Шут, У. М. Шутко, М. С. Шчарбачэня, А. А. Шчарбіна, У. Л. Шыла, Н. Р. Шылкіна, А. В. Шынгель, В. Г. Шынгель, П. А. Шынкароў, Н. Р. Шырай, А. В. Шэдаў, М. І. Шэйпак, С. Р. Шэміс, Г. І. Юркевіч, М. Н. Юркевіч, А. С. Юркоў, І. Якубовіч, М. І. Якуніна, М. І. Якушэнка, Я. Ц. Яраслаўцаў, М. Р. Ярашэвіч, А. В. Ярмоленка, І. І. Ярмусік, В. К. Яроцкі, А. П. Яўланава.

1970. П. М. Абраменка, Н. А. Агнігчанка, В. М. Аксёнава, Н. М. Акунёва, В. А. Алісіевіч, М. С. Аляксеенкава, В. В. Аніщук, А. П. Анцімонік, С. Да. Арлова, К. М. Бабіцкая, М. А. Багдановіч, В. І. Баран, А. В. Бараноўскі, Т. Я. Баталка, Г. М. Баўшава, Т. В. Белянкова, В. А. Бембель, М. Да. Врашко, М. М. Буеўская, М. М. Бусел, А. К. Вяглюк, І. М. Валошын, Г. І. Варанецка, Н. А. Васілеўская, Г. Ф. Вяцкоўскі, М. І. Гарадніч, В. І. Гемская, Н. П. Голікава, Г. М. Грыбоўская, Я. К. Даяменцьеў, З. У. Даямідзенка, Г. Н. Дрожжа, А. Р. Друшчыц, А. П. Дубініна, І. Я. Дуброўская, А. С. Жук, В. Р. Жукавец, І. І. Жураўскі, Т. І. Заяц, В. І. Іцянкова, Н. П. Кавалюка, Р. І. Кавалёва, І. К. Кавалёў, В. П. Кавальковіч, Т. П. Кажамякіна, М. М. Калеснікаў, Т. М. Калядка, З. І. Канавалава, Е. Т. Каралёва, Л. У. Каржыцкая, М. В. Кацэвіч, Л. Г. Кірпічэнка, У. К. Кісялёва, М. В. Козел, Г. П. Корзун, М. П. Косцеў, Ф. Ф. Кудасаў, Да. А. Кудрыс, Н. А. Кулакова, А. Да. Куніцэвіч, В. А. Купрэйчык, М. П. Кучкоў, Г. С. Лабовіч, М. А. Лазарава, М. Ц. Лейфман, Н. М. Лістратава, Л. Я. Лукашок, Н. А. Лукічова, С. З. Ляйховіч, М. Ц. Лялькова, Е. І. Ляшчанка, Д. М. Маёрава, Р. М. Макарэвіч, У. С. Малчанаў, А. Ф. Марозава, Я. І. Марцінюк, Г. А. Мілашэўскі, П. М. Міхалап, Я. І. Муралава, П. А. Мускі, В. І. Назарэвіч, Я. П. Ніцін, І. А. Новік, Г. М. Новікава, Л. К. Новікава, Т. Р. Набарцава, І. Ф. Пабудзінская, Д. А. Пацеенка, Л. Да. Петракова, С. Ц. Пігулеўскі, Г. Ф. Праходская, М. А. Пухава, Н. К. Рабёнкава, К. Да. Рабчынская, Э. А. Рыдзеўскі, Ю. Ш. Рыжына, В. А. Савіцкая, Я. І. Санько, В. Е. Саўчанка, М. М. Саўчанчык, А. М. Сачок, А. Ф. Свістунова, М. А. Сей, Н. К. Сідаровіч, А. Р. Сідракова, А. І. Сінкевіч, Э. Л. Сінкевіч, А. А. Сімчанка, Н. І. Сляпчук, А. А. Собаль, М. І. Сушко, М. М. Сцепаненка, В. А. Талокіна, А. І. Таранда, В. І. Таўбін, Н. С. Трафіменкава, А. Ц. Трацякова, Я. А. Урублеўскі, Т. М. Фадзеева, Н. Я. Філазафовіч, Т. П. Філіпенка, А. П. Цераха, Н. П. Ціханюк, Л. В. Цярэнцьеў, Г. М. Чэпікава, М. Да. Шалай, Л. В. Шалуха, К. Ф. Шандрык, Л. М. Шарава, Л. А. Шнурко, П. П. Шпакоўская, В. П. Шупенькава, Н. І. Шыганава, М. А. Язвінская, Я. І. Якубоўскі, Л. М. Якушава.

Н. М. Ерашкевіч. Мінск.

ЗАСЛУЖАНЫ НАСТАЎНІК ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР за выдатныя поспехі ў галіне прафес.-тэхн. адукацыі выкладчыкам тэхнічных, гарадскіх і сельскіх прафес.-тэхн. вучылішчаў, інспектарам рэсп. і абл. упраўленняў прафес.-тэхн. адукацыі, якія маюць вышэйшую адукацыю і стаж работы ў сістэме не менш як 10 гадоў. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета Беларускай ССР 30.8.1956.

ЗАСЛУЖАНЫЯ НАСТАЎНІКІ ПРАФЕСІЙНА-ТЭХНІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1957. М. Р. Міхневіч, А. Ф. Мозерава, М. Да. Пракоф'еў. 1965. М. М. Арэхаў, А. П. Балейка, У. І. Бараноўскі, В. А. Галанкова, Н. М. Гардзіенка, Я. Я. Грыгуць, М. Ф. Гукаў, В. В. Дамашова, Я. Г. Данільчык, І. Д. Дворкін, Л. К. Забалотнікава, М. А. Каліта, У. І. Крывашэеў, Я. Р. Курдзюкоў, М. Х. Лазараў, М. А. Лісецын, Л. В. Натараў, У. А. Небальсін, Л. М. Панамарова, М. Г. Пераплётчыкаў, К. Я. Плаўнік, Р. Ф. Рэшчыкаў, Р. М. Смерціна, Н. Л. Смірнова, В. Т. Суворай, Ф. Я. Шайдураў, У. В. Ягораў, І. В. Якаўлеў, С. М. Яфімаў. 1967. У. С. Біткірэвіч, М. А. Быкоўскі, У. К. Бычынаў, Л. В. Ведзянеева, Я. І. Верашчагін, М. А. Давыдзенка, М. І. Добін, Х. А. Котава, Р. Р. Кучук, А. В. Львоў, Да. Р. Лявіцкі, Б. А. Міткін, В. П. Міхалковіч, С. М. Мурко, Я. С. Пагаралы, В. І. Пятрова, М. І. Раманаў, Я. В. Сікорская, А. І. Цітоў, С. Я. Шарупіч, П. І. Якімаў. 1968. А. С. Зайцаў, А. І. Куранцова, А. Я. Ларын, Ф. К. Латышцаў, Н. М. Лукошка, Г. М. Лявончанка, М. Г. Макулік, В. П. Марушчак, М. П. Новікава, П. Г. Салаўёва, 1970. М. П. Аронаў, Г. І. Вацлоўская, Я. С. Бергер, А. М. Вапечкін, А. А. Камлыкоў, Е. К. Мельнікава, С. П. Пархімовіч.

ЗАСЛУЖАНЫ РАБОТНІК БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высококваліфікаваным рабочым, інж.-тэхн. работнікам і служачым прадпрыемстваў, арг-цый і ўстаноў службы быту, за працу ў сістэме быт. абслугоўвання насельніцтва не менш як 10 гадоў і за вял. заслугі ў развіцці і паляпшэнні быт. абслугоўвання насельніцтва. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 6.5.1970.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР

1970. С. М. Адамовіч, А. У. Амбражэвіч, А. Ц. Астрайка, Н. Ю. Бадазюк, Г. У. Баранчук, І. П. Барысевіч, М. І. Борухава, М. П. Валодзін, Ф. Ф. Валодзін, Л. І. Варшаўская, П. Ф. Волкаў, М. К. Вялюга, І. Б. Герко, Н. А. Гранькова, У. К. Гушча, М. Ф. Даямідава, Л. І. Драздоўская, Г. Е. Дубіцкая, Г. Р. Дудко, П. Г. Іванова, З. В. Кліменка, А. І. Коўчур, Н. К. Красоўская, Д. В. Кудзь, І. І. Кулькоў, Я. П. Ляхаў, М. Я. Махаёва, М. К. Мацукевіч, А. Я. Мелкаступаў, М. Р. Міхайлаў-Грыцаў, Л. І. Наркевіч, Г. І. Перык, Р. І. Прэпесць, Ф. Дз. Ропат, В. Ц. Скарабагатая, Я. І. Суслава, І. В. Талочка, І. А. Тапырык, С. Дз. Чухловін, В. М. Чыжонак, І. А. Чычэрын, А. С. Шаўроў, І. А. Шымановіч. **1967.** В. А. Асіпок, А. Х. Аўсеенка, Л. П. Барвінак, В. К. Зверава, І. І. Калеснікаў, М. П. Карташова, В. Ф. Конаш, Я. Е. Краз, С. В. Лембрыкаў, Н. С. Семянюк, А. А. Трацэўская. **1968.** А. Р. Арастовіч, М. М. Багдановіч, З. С. Бадрова, Н. А. Балотнікава, Н. М. Бірукова, А. М. Бычкоў, Т. І. Вадаходава, Б. Р. Гельфанд, Л. Ф. Голубева, П. І. Гурына, Е. А. Забродская, В. А. Задала, М. П. Ігнацьева, В. М. Калур, Х. Е. Камінская, Т. С. Каськовіч, П. І. Катаводаў, І. А. Крамарэнка, М. А. Краўцова, Л. М. Кротаў, Л. І. Кручкова, З. М. Кузняцова, В. М. Куніцэвіч, К. Л. Ластоўскі, Г. А. Лукашэвіч, Г. С. Мазыко, Г. С. Міранавіч, Л. М. Новікава, А. Д. Падаляк, Н. Г. Парфянкова, Л. С. Паўроз, І. М. Піліпейка, М. Ф. Ружанцова, Н. С. Саракалетава, В. І. Свірыдо, В. К. Сцепаненка, А. В. Тоўкань, М. А. Хартонік, А. І. Хромава, Н. А. Шандрыгіна, М. М. Шастакова, А. Дз. Шубіч, Я. Ц. Шылаў. **1969.** І. Я. Бутрым, А. І. Палійкіна, К. І. Палкіна, В. Д. Стрэж, Г. П. Сценнік, М. Я. Шведава, Г. Д. Якавенка. **1970.** Т. П. Абабкава, В. А. Бярозка, Н. І. Гутарава, М. М. Данілевіч, З. П. Кладкевіч, М. Я. Кудзінаў, З. Л. Ліхавідава, Н. М. Майдзецкая, В. М. Мяхоніч, В. А. Папуша, Я. К. Станішэўская. К. С. Сыраквашына, В. М. Уласюк, К. Д. Шэлегава. **1971.** С. Ф. Ажахоўская, Л. В. Бутраменка, В. М. Воранаў, В. Ф. Галубко, Н. Дз. Грыгарэўская, Т. Ф. Дзевятуха, А. І. Зарэцкая, У. М. Манаева, Е. І. Маслакова, С. С. Самахвал, К. І. Сапяжынская, Н. І. Сусько, Н. С. Цішкевіч, М. С. Шумская, Т. П. Юркова, Н. С. Яжэлева.

ЗАСЛУЖАНЫ РАЦЫЯНАЛІЗАТАР БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аўтарам рэалізаваных рацыяналізатарскіх прапаноў, што ўносяць істотны ўклад ва ўдасканаленне вытворчасці і павышэнне прадукцыйнасці працы, якасці прадукцыі, паляпшэнне ўмоў працы і тэхнікі бяспекі, а таксама за шматгадовую сістэматычную рацыяналізатарскую дзейнасць. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 9.10.1959.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1960. Х. І. Гандэльман, Я. А. Грамкін, Р. С. Ермашкевіч, М. М. Жукаў, У. А. Забяжаеў, І. М. Зарэцкі, В. П. Зданкевіч, А. К. Іваноў, К. К. Крашчановіч, В. М. Пагадаеў, У. А. Пазднякоўскі, Б. В. Растапін, У. П. Русак, В. Л. Сакалоў, Л. І. Свістун, У. Д. Свічкароў, В. М. Скляднеў, П. Р. Стацэнка, М. П. Тадыкін. **1963.** А. А. Барташэвіч, Р. С. Бражэнас, А. С. Пуставайтоўскі, Л. К. Скуратовіч, А. І. Шылкін. **1964.** В. А. Антонаў, М. Я. Афончанка, Р. М. Багдасараў, А. І. Баранавіч, І. Дз. Вярбіцкая, І. Р. Гаража, А. Я. Дамтрыеў, І. М. Ермакоў, Р. К. Жолтак, У. В. Звіжкоў, Р. М. Іваноў, М. П. Іхно, У. А. Казлоў, У. Ф. Кісінскі, В. М. Корбут, В. І. Кушпарэнка, А. М. Мартыненка, М. З. Марціновіч, М. П. Марчанка, У. К. Масюкоў, Дз. І. Мечнік, П. Я. Прыцкер, Э. В. Радкевіч, А. Е. Смірноў, Р. Ш. Столяр, Я. М. Сцяпанаў, У. А. Трайц, А. К. Трыгубовіч, А. А. Усаў, С. Р. Фарбер, Дз. С. Фролкін, І. К. Хаба, І. Н. Хібнік, А. І. Хлапіцкі, А. П. Шафоў, Н. І. Шофер. **1966.** М. Р. Грынкевіч, Л. І. Кумэ-Кулеш, У. Р. Пекеліс, В. У. Пятрышчаў. **1967.** М. А. Ардо, І. А. Баранцэвіч, С. М. Барысаў, А. Л. Бераснёў, Л. Р. Біржакова, П. І. Бойш, Ю. Ф. Боткіна, В. І. Брыч, П. В. Валавод, П. Г. Васілеўскі, Ф. С. Віцебская, Р. П. Гальперын, І. Л. Гапановіч, Я. П. Гееўскі, І. М. Гурэвіч, А. Р. Дзядзін, П. А. Жураў, І. Ф. Казлоўскі, П. П. Какоткін, Р. А. Карвяк, У. М. Кошаль, У. А. Кузняцоў, І. Я. Лашкоў, В. М. Любецкая, П. М. Макарэвіч, К. Р. Манахаў, Д. А. Марчанка, У. Р. Маскалёў, Н. Ф. Мелавацкая, М. М. Міско, М. Р. Пацюк, С. Ф. Патапаў, І. С. Пацехін, Л. А. Раманоўскі, Э. Е. Сафроненка, С. К. Сівохін, П. А. Сматрыцкі, В. П. Спічэўская, А. А. Харашчо, А. Л. Цыркуноў, Г. А. Цярэшка, А. В. Чыжэўскі, К. М. Чыстабаеў, І. М. Шамес. **1968.** В. Я. Аварʼянаў, Г. М. Анфіягенаў, М. М. Ахрамовіч, А. М. Бабенка, М. Г. Баканаў, В. М. Ванін, П. Ю. Васілюк, А. М. Вынта, А. Р. Данін, В. А. Зінькоўскі, М. Н. Конюхаў, А. М. Куніцэвіч, Ф. Л. Ліпатаў, А. М. Лысы, У. П. Маркоўскі, А. У. Навуменка, У. М. Пятроў, В. С. Раманенка, У. Г. Сягодзік, Я. Г. Сойка, М. П. Стома, І. С. Тараеў, Я. Ф. Туфлін, Я. М. Удзенскі, К. В. Чаравухін, У. Т. Чуракоў, І. П. Шпавалаў, М. Я. Ягораў. **1970.** С. Я. Абросімаў, В. К. Антонаў, М. І. Арашонак, Г. А. Асколаў, В. А. Ганелец, В. К. Гаўрыленка, Я. Е. Грыгор'еў, Э. Л. Гузоўскі, М. К. Данільчук, У. А. Зязюлін, Ф. Л. Іскароў, Э. У. Іскроў, А. В. Калошын, Б. І. Крыніцкі, Б. В. Лазарчык, А. Ф. Папялюхоўскі, В. В. Подух, А. А. Чайкоўскі, Ю. А. Шчарбакоў, Я. С. Юрчанка, А. М. Яршчанка.

ЗАСЛУЖАНЫ СУВЯЗІСТ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным работнікам сувязі за працу па спецыяльнасці не менш за 10 гадоў і за асаблівыя заслугі ў забеспячэнні высакаякаснай, бесперабойнай работы і развіцці сродкаў сувязі, укараненні новай тэхнікі, арганізацыі ўзорнага абслугоўвання насельніцтва, прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, калгасаў і саўгасаў усімі відамі сувязі. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 15.12.1965.

ЗАСЛУЖАНЫЯ СУВЯЗІСТЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1966. Н. Н. Аянбаева, Л. М. Анейчык, П. В. Афанасьеў, М. В. Барсегян, М. Ф. Валенда, А. П. Ганчарык, М. І. Гушчынская, П. Ф. Должыкаў, М. Ф. Ептухоўскі, Ф. І. Жывіца, У. М. Жыгмунт, І. А. Зракаў, Л.-М. Д. Кацаў, А. Ц. Каштэнка, І. М. Кваша, Я. П. Кернажыцкі, А. І. Каржанеўскі, І. К. Маркаў, У. Т. Паслядовіч, А. П. Сісковіч, К. В. Фралоў, П. А. Шклівяліна, І. Е. Яначкін. **1967.** П. К. Аўсеʼян, У. А. Булыбенка, Л. П. Заяц, М. П. Карэцкая, Л. У. Касцюшка, І. М. Лугін, І. Х. Лурʼе, І. Я. Мядзведзеў, Н. І. Ніялаў, П. І. Несцераў, П. А. Савельеў, С. К. Сівохін, Г. Дз. Шацкі, Т. А. Янкоўская, А. С. Яўрэінаў. **1968.** І. С. Алейнікаў, З. В. Аляксеева, Я. К. Андрэева, З. В. Белановіч, А. М. Быкава, В. М. Васільеў, М. А. Вожыкава, А. П. Вырвіг, Ф. І. Гуз, І. М. Кановіч, С. І. Красненка, М. В. Маньковскі, К. А. Марцінкевіч, М. С. Панкоў, А. А. Пшанічнюк, М. А. Старасцін, А. П. Старыковіч, Р. Я. Уладысік, Г. В. Хіжынскі, М. М. Шалега, С. М. Юранаў. **1969.** П. П. Вальскі, Н. М. Загудаева, В. П. Капарыха, Л. С. Нурыева, І. П. Фурманаў, Р. І. Хадасевіч, У. К. Харытонаў, Т. А. Хацкевіч. **1970.** М. І. Бондарава, Л. К. Галаванава, В. А. Гардзеева, М. Т. Дэхта, У. І. Ільюцік, А. П. Карач, Р. Р. Кастравая, В. Ц. Курачэнкава, С. А. Папковіч, М. А. Прымшыц, Г. Ф. Пшаслаўская, І. В. Сіротскін, М. С. Слынко, Р. М. Філатаў, У. І. Чарнуха. **1971.** М. В. Банькоўскі, К. У. Буйніцкая, Л. М. Горская, А. Я. Даляко, І. Я. Зверач, Ф. К. Ісаеў, Я. В. Кніга, У. В. Куптыш, В. П. Максімовіч, Я. С. Малахаў, Я. А. Маркоўская, А. А. Мураўёў, А. Ф. Невар, М. М. Расоха.

ЗАСЛУЖАНЫ ТРЭНЕР, гл. *Званні спартыўныя.*

ЗАСЛУЖАНЫ ЎРАЧ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР урачам урачэбных пунктаў, амбулаторый, раздзільных дамоў, бальніц, паліклінік і інш. лячэбна-прафілактычных і санітарных устаноў, што працавалі ў гэтых установах не менш як 10 гадоў і вызначыліся практ. дзейнасцю ў галіне нар. аховы здароўя. Устаноўлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 4.7.1940.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЎРАЧЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1941. М. Н. Анісімава, В. А. Бароўскі, М. М. Глухоўскі, С. І. Гутман, І. П. Ермачэнка, Я. І. Іазэфсон, С. Т. Ільін, М. І. Кавалёнак, В. І. Каган, М. А. Карначэнка, В. П. Лапцейка, Р. С. Левін, І. А. Лурʼе, Р. М. Манесзон-Любіна, Б. В. Рыскін, Х. С. Скалабан, А. А. Стальберг, Г. І. Татарская, М. А. Тунік, А. А. Ушакевіч, Б. А. Файнштэйн, П. Я. Церашкоў, А. П. Цярпугаў, Г. П. Шаравараў, К. З. Швыркуноў.

1948. І. І. Багдановіч, Р. Ю. Берлін, Т. В. Бірыч, М. І. Бобрык, П. П. Даўголікаў, Н. М. Кавалёў, А. А. Караткевіч, П. Ц. Комаў, І. М. Літашэнка, С. С. Лукашэвіч, У. В. Марзон, М. С. Маскова, А. Я. Мітрашэнка, М. Ц. Пятроў, М. Б. Смольскі, І. М. Стальмашонак, І. М. Хмялеўскі, А. І. Шуба.

1949. І. Г. Бабіцкі, І. Г. Баханоўіч, Д. С. Віткін, А. І. Вольскі, А. Ф. Жаўрыд, М. І. Красоўскі, С. І. Ліяранцевіч, М. Б. Майзель, А. С. Мікульскі, М. І. Намеснікаў, І. Е. Новаш, К. Дз. Паўлюкоў, А. Ф. Саламаха, І. М. Сафонаў, А. С. Сямёнаў, Л. А. Фігоўскі, І. М. Фінкевіч, Ф. А. Храпко, Л. А. Чарнышкова, Ф. Я. Шульц.

1956. К. Ф. Градзіцкі, Г. В. Кот, Д. М. Кулік, І. С. Лягенчанка, У. Ю. Мірончык, Г. І. Нядбайлік, Я. Я. Сяркова, В. В. Шушкевіч, З. А. Шымкевіч.

1958. А. А. Абановіч, М. А. Аляксеева, М. К. Арэшкава, І. І. Астапенка, С. П. Афоненкаў, В. А. Вараб'ёў, В. М. Гарыенка, І. А. Кажанкоў, Ф. Ф. Касуха, І. Г. Паляшчук, А. І. Перлаў, М. Л. Плугатар, П. М. Радкевіч, Т. Е. Савіч, Л. А. Стахоўская, М. А. Сяркова, П. М. Хлус, В. П. Шчогалева, Г. У. Якубоўскі.

1959. І. Б. Аляшкевіч, М. М. Громава, А. Р. Заводчыкава, Н. В. Клікунец, А. М. Палыгаліна.

1960. М. А. Азіміна, Н. М. Акімава, З. Г. Алікіна, В. Ф. Бабіцава, Е. Р. Брэус, А. Д. Бярговіна, Н. А. Вараб'ёва, Т. С. Гапеенка, П. Д. Гарбацэвіч, Н. К. Гарэнка, З. В. Грэчыкава, Н. П. Дабрыніна, Н. Я. Дзеравяжка, А. Ф. Емяльяненка, Л. Ф. Жалахаўцова, Т. А. Ждановіч, М. А. Жыгар, С. А. Заблоцкая, Н. П. Залатарская, А. І. Іванова, М. В. Каваленка, В. Я. Каган, І. Ф. Каралёва, Н. Р. Катлоўская, Е. Р. Ківа, Л. Д. Корбут, Н. А. Корзан, Т. Я. Крывіцкая, Г. Л. Лаўрыненка, С. В. Лісоўская, А. Ф. Лойка, Г. Дз. Марчанкова, С. М. Мац, Л. А. Медраш, А. П. Меншыкава, Г. І. Меркушава, М. М. Мінайлава, В. П. Нікіфарава, З. Ф. Нікіціна, З. М. Пазняк, М. В. Папова, М. І. Пейсаховіч, В. М. Поляк, Н. М. Равяка, Е. І. Раманькова, Н. І. Рудзік, М. С. Сімановіч, Н. Л. Смірных, Н. С. Сняжко, К. М. Сянько, Т. Н. Фёдарава, А. А. Цвяткова, Л. А. Чарнуха, П. П. Шакалава, М. І. Шамко, З. Я. Шырын, Г. А. Юркаўцава, Т. І. Якаўлева, Г. М. Якубцынер, К. С. Янушкевіч, А. М. Ярошына.

1961. В. І. Альшэўская, Н. Р. Афанасьева, Г. І. Багданава, І. В. Балычаў, Р. І. Бір, Ф. А. Брагінская, В. М. Варажэйкіна, Е. І. Віталёў, М. К. Гардон, І. К. Гарэльчык, Т. М. Гельман, Дз. Я. Гіркін, Н. А. Гуцько, А. М. Дамброўская, К. М. Дарашэнка, І. І. Дзядзюра, С. Г. Дулаеў, Е. С. Жукоўская, В. Дз. Жукоўскі, Р. П. Індзінт, Т. Н. Каваленка, У. Л. Каладоўскі, Т. Ф. Корпусава, А. Ф. Крывашчокі, М. Ц. Кудрын, А. Е. Курачкаў, М. В. Лапаткіна, Н. С. Лебедзь, Л. А. Магер, Ф. А. Марыніч, Ф. А. Марынкевіч, А. М. Маўшовіч, К. А. Мацапура, І. А. Мацвееў, М. М. Мілер, В. К. Някрасаў, А. І. Паліенка, С. І. Прасноў, А. М. Русаковіч, Я. С. Сает, Г. А. Саўкова, М. Ю. Сіліч, Л. К. Сокалава, М. М. Спірыдонаў, В. А. Старасціна, Р. А. Сырнікаў, В. Дз. Тамілін, А. І. Тоўба, В. Р. Цішчанка, В. І. Цымбаровіч, М. А. Цярэшчанка, Н. М. Шчацініна, Н. М. Ярмаловіч.

1963. Ю. Г. Батура, Я. Я. Бонч-Асмалоўскі, Г. У. Бурдзін, І. М. Герасімовіч, В. П. Камароў, Л. П. Навалодскі, Р. А. Шапіра.

1964. В. А. Александровіч, Я. А. Алесін, В. Ф. Арленка, А. Л. Вейнберг, Г. М. Віко, М. М. Герасіменка, І. У. Гранкоў, К. П. Грышанкова, А. Л. Дарасінскі, І. Л. Друян, І. Ю. Жалкоўскі, І. А. Інсараў, В. Л. Казлова, У. Н. Капусцянскі, І. Б. Кардаш, А. К. Касач, А. Ф. Клімава, Н. В. Красоўская-Чарнышова, К. Р. Круцько, М. Г. Кулін, К. М. Леанкова, П. Р. Любянкова, Р. І. Палей, М. В. Паўлавец, З. К. Русапава, Ф. С. Сальнікаў, Н. Я. Сямак, Я. Р. Сянюк, А. Дз. Удавенкаў, Р. Я. Цемахоў, В. В. Шырын.

1965. Г. В. Адамава, В. М. Бяспалава, К. Я. Герасімава, В. Дз. Жукоўская, М. П. Казлоў, Д.-Г. Б. Кантар, А. М. Кісялёва, Ф. А. Корбут, Г. М. Лебедзева, К. А. Ледаўскіх, Н. А. Нікалаенка, В. В. Папковіч, В. І. Паралова, П. С. Ржавуская, П. А. Рудзік, К. В. Сабалеўская. А. І. Салаўёва, Е. І. Смірнова, М. П. Усевіч, М. Дз. Фёдарава, В. І. Хорава, К. П. Чэпік, П. В. Шатровіч, А. У. Шыдлоўская, І. У. Яршоў.

1966. А. Ф. Апанёнак, В. Р. Бакурына, Р. В. Бараш, А. Ю. Беленькі, Р. А. Ганкіна, М. І. Герасімовіч, А. Р. Дзем'янкоў, С. У. Дзмітрыеў, М. У. Данісава, Г. Е. Дубіцкая, Н. М. Запясочная, М. І. Катовіч, М. А. Кнак, К. Ш. Кугель, М. П. Курчаў, І. Е. Кутасаў, Н. М. Макавец, В. М. Мардвінаў, С. З. Меклер, Н. І. Наздра, Л. С. Пінчук, І. Л. Прудзінкава, В. Ф. Пташнік, І. А. Радзецкі, І. І. Рамашка, Т. І. Русакова, Н. І. Сахарава, А. І. Сачак, Л. А. Светачава, Д. Ф. Скарапанава, Ф. В. Старавойтаў, Н. У. Стракалава, Н. І. Сцепаненка, У. М. Талкачоў, А. І. Фятняева, Г. А. Цгоеў, Дз. П. Шавялёў, І. М. Шапіра.

1967. К. Л. Апішчанка, Л. Ф. Байцова, Н. М. Берабеня, А. А. Бокач, Дз. П. Бяляцкі, Л. В. Галенчык, Т. Ф. Гузава, Г. А. Гуць, Е. П. Драздова, В. П. Зінько, Дз. І. Каласоўскі, Е. Я. Кронава, Н. М. Кучынская, С. К. Лапацін, В. М. Матора, Л. І. Міхновіч, С. А. Мішакова, І. В. Нічыпарук, М. П. Падбярэзная, А. М. Пазняк, В. М. Прохарава, Е. А. Ржавуская, Н. У. Селіванчык, А. М. Сельдзімірава, М. В. Трусава, М. І. Харын, В. П. Цімаш-

кова, Р. Р. Чарнова, К. Р. Чарняўскі, Ф. М. Чмель, А. М. Шаўлягін, Г. У. Шаўлякова.

1968. П. В. Аляксейчык, Г. Г. Аляхновіч, Г. П. Андрусевіч, А. Г. Антонаў, Л. М. Афоніна, А. М. Бакалаў, В. Ц. Бакун, А. К. Брагін, Г. Т. Буглак, Н. Дз. Букацкая, А. Ю. Букач, В. С. Былінская, Я. З. Бычкоўскі, А. Г. Вялевіч, Г. П. Валачковіч, В. Дз. Варанкова, Ю. І. Ваяводзін, В. М. Вейсенберг, Г. А. Векшына, Н. І. Вінаградава, В. А. Вяржбіцкая, Н. П. Галаванава, М. А. Галубцоў, Г. С. Гарбацэвіч, В. А. Гаўрыленка, І. І. Голікаў, Г. І. Гроздзева, М. І. Громава, А. І. Гурскі, А. М. Дабрынін, В. І. Давыдоўская, К. Р. Дайнека, М. І. Дашкевіч, Н. Ф. Драгун, З. А. Дуваніна, В. Г. Дунке, А. І. Жаваранкаў, У. М. Ждан, Г. А. Забоеў, В. У. Забродскі, Дз. С. Ізмайловіч, У. С. Ілбоўнік, А. М. Кавалёва, А. М. Каешка, Г. Г. Казюра, А. П. Каласкоў, Н. Ф. Каленчыц, В. С. Каллдка, М. А. Канцэвіч, Я. К. Карасёва, Г. М. Касцевіч, У. Ф. Клімаў, М. А. Концюх, Я. П. Круглік, Г. І. Лабзова, Я. Ц. Лахманоў, Н. С. Леках, С. А. Лемяшонак, Г. А. Лешукова, А. А. Ліпень, Б. М. Ліўшыц, Л. Ц. Ліцкевіч, П. П. Лукашэвіч, В. І. Ляшчынскі, А. І. Малаш, Ю. І. Марцішонак, З. Р. Міхалап, С. І. Міцкевіч, Я. Н. Мядзвецкі, М. Л. Мяснікова, Я. З. Найдзёнава, В. А. Некрашэвіч, В. Ц. Новікаў, А. А. Няверка, М. Ф. Панцэвіч, Ф. А. Паперная, В. В. Папова, А. І. Паруль-Мяркулава, М. І. Паўлючук, Ф. Е. Плоткіна, Ю. А. Пшанічнікава, Л. Н. Рабец, В. А. Радзівонава, В. Г. Ражкова, Л. Г. Рукман, Р. А. Русак, П. Я. Рыжова, К. С. Рымша, І. М. Сабкевіч, Л. В. Савінкова, З. П. Савянкова, М. А. Саламаха, К. М. Самсонік, А. І. Саракавумаў, І. Г. Саркісян, К. Я. Саўчанка, А. П. Сідарава, М. М. Скрыган, В. А. Смалякоў, В. С. Спірыдонава, П. І. Станішэўскі, В. В. Стараселец, Л. С. Суравіцкая, А. С. Сушко, А. Р. Сцяпанаў, М. В. Тарасік, С. С. Тарасік, А. Ц. Татарынаў, М. Г. Токар, Г. У. Толкач, А. А. Тшаскоўскі, М. Р. Умінская, Я. С. Урбановіч, Г. Л. Філімонава, Р. У. Фомчанка, Л. Х. Хасін, Л. С. Цімчанка, В. Л. Чарнуха, Н. А. Чахоўская, В. С. Чурылава, Я. С. Чыжыкаў, У. Г. Чэшык, В. У. Шавалдышава, Т. С. Шаткоўская, К. І. Юрчанка, М. Р. Якабсон, У. А. Януковіч, Я. В. Яцкова.

1970. Т. М. Алефірэнка, К. М. Аніщанка, А. Р. Арцюшэнка, Ф. А. Багдановіч, М. У. Барысевіч, А. І. Бондараў, А. А. Дзядзюля, Л. Ц. Дзянісава, Ф. І. Жукоўскі, Л. Я. Забаронак, М. І. Калач, Л. Д. Каржуева, Л. М. Каронік, В. В. Кірыльчык, А. Ф. Кічаў, Р. В. Куліч, Т. А. Леановіч, Ф. Ц. Малышаў, Т. А. Наско, В. І. Невядомскі, Г. Ц. Несцер, Т. Ц. Паддубная, І. А. Паторская, Н. М. Расалоўская, С. І. Самарцыеў, Н. А. Сільнова, Л. К. Тапальскова, М. А. Турко, К. Ф. Усольцаў, Н. І. Хадасоўская, М. А. Чыгір.

Л. М. Гаршанава. Мінск.

ЗАСЛУЖАНЫ ШАФЁР БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным шафёрам за працу па спецыяльнасці не менш як 15 гадоў і за вял. заслугі ва ўдасканаленні арганізацыі работы аўтамаб. транспарту, за эфектыўнае выкарыстанне тэхнікі і забеспячэнне безаварыйнай работы. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 21.10.1968.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ШАФЁРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1968. К. Ф. Атрашэўскі, І. Л. Аўрамаў, В. І. Балашоў, К. В. Васільеў, П. І. Дзяржаўцаў, М. А. Драч, У. Н. Казлоў, М. М. Кір'янцаў, Ф. М. Клімянцьеў, А. С. Кончыц, В. В. Крук, Дз. І. Куханаў, В. Д. Максімішын, Т. М. Мядзведскі, В. І. Петрык, Н. Я. Петрыкевіч, У. С. Піскун, Л. А. Распшэўскі, Р. Я. Снытко, В. А. Сяліцкі, М. В. Трошкін, І. А. Уліцкі, У. А. Філіманюк, А. А. Храменкін, І. П. Цыбулька, В. А. Шэін.

1970. У. Р. Азараў, У. Р. Багданаў, І. А. Беластоцкі, Р. М. Валюкевіч, Дз. І. Вярыга, М. П. Герасімовіч, І. І. Гулевіч, А. К. Гулееў, В. В. Дабрынеўскі, П. М. Драбышэўскі, І. Ц. Дрындрожык, В. Ц. Завядзееў, П. І. Зялёнка, А. І. Казакоў, П. С. Касінец, У. Д. Крывец, І. К. Ліпніцкі, В. В. Ліпскі, І. А. Малееў, П. М. Марозаў, П. К. Міхалёнкаў, М. І. Мурашка, Х. І. Муха, К. М. Нарлікоў, М. І. Плотнікаў, У. М. Пузына, М. М. Рожа, В. Р. Рычагоў, Ц. П. Савонаў, М. І. Тхораў, Р. А. Хаўратовіч, С. П. Чайкоў, Ч. В. Часноўскі, А. С. Чуляшоў, М. П. Шамшын, І. А. Шуба, А. В. Шыдлоўскі, К. П. Юда, В. П. Юзюк, У. В. Якімовіч, С. С. Ясюкевіч.

ЗАСЛУЖАНЫ ЭКАНАМІСТ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным эканамістам прадпрыемстваў, арг-цый, саўгасаў, калгасаў, міністэрстваў, планавых, фін., банкаўскіх і статыстычных органаў за працу па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і за вял. заслугі ў практ. дзейнасці па паляпшэнні арганізацыі, удасканаленні і павышэнні ўзроўню эканам. работы ў галінах нар. гасп. і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 6.11.1970.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЭКАНАМІСТЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1971. Ф. З. Аблавацкі, М. І. Аксючыц, А. Ф. Алісееў, В. С. Гук, Т. А. Зіміна, З. З. Клугін, В. В. Лапаціна, Д. А. Літвішка, К. В. Локцен, М. А. Лугаўцоў, А. І. Малахава, В. П. Марчук, І. П. Маскалёў, В. Дз. Мінеев, Р. Л. Нескаромны, В. І. Новікаў, П. В. Памялова, В. Ф. Рамашэня, Н. А. Рашчактаева, У. М. Скуратовіч, Н. С. Таміна, Н. В. Удавічэнка, П. В. Цярэшка, А. М. Чубрык, П. М. Шэлег.

ЗАСЛУЖАНЫ ЭНЕРГЕТЫК БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным рабочым вядучых прафесій, інж.-тэхн. работнікам электрастанцый і падстанцый, электрычных і цеплавых сетак, будаўніча-мантажных, паладачных і рамонтных арг-цый, н.-д. і праектных ін-таў за працу па спецыяльнасці не менш як 15 гадоў і за вял. заслугі ў развіцці і ўдасканаленні энергетыкі рэспублікі. Установлена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 24.12.1970.

ЗАСЛУЖАНЫ ЮРЫСТ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ганаровае званне, якое прысвойваецца Прэзідыумам Вярх. Савета Беларускай ССР высокакваліфікаваным юрыстам за працу па спецыяльнасці не менш як 10 гадоў і за вял. заслугі ва ўмацаванні сацыяліст. правапарадку, у забеспячэнні выканання законнасці, развіцці прававой навукі, падрыхтоўцы заканадаўчых актаў і прапагандзе сав. заканадаўства. Установлена Указам Прэзідыума Вярх. Савета БССР 31.1.1966.

ЗАСЛУЖАНЫЯ ЮРЫСТЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1967. І. З. Асіпцоў, В. З. Барыскін, С. А. Бясонаў, В. І. Верамянюк, С. Дз. Глазаў, М. С. Глазкоў, У. І. Дзерышаў, Н. В. Кавалёў, В. Ц. Камнскоў, С. І. Камрукоў, Я. А. Коўган, П. К. Лугін, І. А. Луцэвіч, М. А. Палавінка, С. Ф. Панін, М. М. Рабы, П. І. Рудзеня, Т. А. Суржынка, В. П. Уткіна, М. П. Шугай, М. М. Шыманскі.

1968. А. Г. Бондар, П. І. Гарэлік, Я. П. Дзіжынія, М. К. Жаўняровіч, П. М. Захарошка, А. І. Карнач, І. М. Мазураў, У. М. Мельнікаў, С. М. Наследнікаў, А. Ф. Папісаў, В. А. Станцэль, Я. І. Стафановіч, З. Ф. Чавусава.

ЗАСНАВАЛЬНІЦКІ ПРЫБЫТАК, прыбытак, які атрымліваюць капіталісты — заснавальнікі *акцыянерных таварыстваў* пры іх арганізацыі і эмісіі акцый. Складае розніцу паміж сумай цэн прададзеных акцый і сумай сапраўднага капіталу, укладзенага ў акцыянернае прадпрыемства.

ЗАСОЎЕ, вёска ў Задор'еўскім с/с Лагойскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр саўгаса «Лошва». За 58 *км* на Пн ад Лагойска, 98 *км* ад Мінска, 43 *км* ад чыг. ст. Буделаў. 232 ж., двароў 51 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. 2.5.1943 ням.-фаш. захопнікі спалілі больш за палову вёскі, загубілі 382 мірных жыхароў.

ЗАСТАРЫННЕ, вёска ў Пліскім с/с Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «XXI з'езд КПСС». За 47 *км* на У ад Бешанковіч, 36 *км* ад Віцебска. 200 ж., гасп. 65 (1971). Клуб, б-ка, магазін.

ЗАСУЛІЧ Вера Іванаўна [27.7 (8.8).1849, в. Міхайлаўка Гжацкага пав. Смаленскай губ.— 8.5.1919], дачка рускага рэвалюц. руху. З дробных дваран. У рэвалюц. руху з 60-х г. Уваходзіла ў народніцкую арг-цыю «Чорны перадзел». З 1880 на пазіцыях марксізма. У 1883 в Г. В. Пляханавым удзельнічала ў стварэнні марксісцкай *групы «Вызваленне працы»*. Вяла перапіску з К. Марксам і Ф. Энгельсам, перакладала на рус. мову іх творы. З 1900 у складзе рэдакцый ленінскіх газ. «Искра» і час. «Заря». Пасля II з'езду РСДРП адна з лідэраў меншавізму. У гады рэакцыі далучалася да ліквідатараў, у 1-ю сусв. вайну на пазіцыях сацыял-шавінізму. Да Кастр. рэвалюцыі паставілася адмоўна. У. І. Ленін востра крытыкаваў паліт. памылкі З., разам з тым высока цаніў яе рэвалюц. дзейнасць у першы перыяд.

Тв.: Сборник статей, т. 1—2, СПб., 1907; Воспоминания, М., 1931; Статьи о русской литературе, М., 1960.

Літ.: К. Маркс, Ф. Энгельс и революционная Россия, М., 1967; Ленін У. І. Тв. [гл. Даведачны т., ч. 2 (Справочный т. к Полн. собр. соч., ч. 2)]; Фазни З. Санкт-Петербургская быль, М., 1969.

А. В. Вараб'ёў. Мінск.

ЗАСУЛЛЕ, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., на р. Ліўянка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Праўда». За 18 *км* на ПнУ ад Стоўбцаў, 96 *км* ад Мінска, 8 *км* ад чыг. ст. Коласава, на шашы Стоўбцы — г. п. Івянец. 984 ж., двароў 281 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі, бальніца, аптэка, аддз. сувязі, 2 магазіны. У 1941 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАСУХА, комплекс аграметэаралагічных з'яў у глебе і паветры, які парушае водны баланс раслін. Прыводзіць да памяншэння або гібелі ўраджаю.

Бывае атмасферная (нізкая адносная вільготнасць і высокія т-ры паветра), глебавая (у глебе мала вільгаці, і яна мала або зусім не паступае ў карэнне раслін) і фізіялагічная (раслінам не хапае вільгаці з-за нізкай т-ры глебы). Узнікае ў антыцыклонах і часта спараджаецца сухаверхамі. З. бывае ў ЗША, Паўд. Амерыцы, Кітаі, Індыі і Пакістане, Паўд. Еўропе, Малой Азіі, у Афрыцы, а таксама на Пд і ПдУ Еўрап. ч. СССР, Казахстане, Зах. Сібіры. У нашай краіне вядзецца барацьба з З.: снегазатрыманне, падбор засухаўстойлівых культур, насаджэнне полеахоўных лясных палосаў і інш. На Беларусі ў асобныя гады ўлетку бывае засушлівае надвор'е з высокай (болей за 30 °С) т-рай паветра, нізкай (20% і ніжэй) адноснай вільготнасцю і нязначнымі запасамі вільгаці ў глебе, якія неспрыяльна уплываюць на ўраджай.

Літ.: Засухи в СССР, их происхождение, повторяемость и влияние на урожай, Л., 1958.

ЗАСЦЁНАК, 1) ворныя і сенакосныя землі, якія апынуліся па-за межамі сялянскіх надзелаў пасля *«Уставы на валокі»* 1557. 2) Паселішча хутарскога тыпу дробнай шляхты, якая арандавала гэтыя землі.

ЗАСЦЁНКІ, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл., на правым беразе Дняпра. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Перамога». За 27 *км* на ПнУ ад Дуброўна, 120 *км* ад Віцебска, 7 *км* ад чыг. ст. Краснае, каля шашы Масква — Брэст (1,5 *км*). 277 ж., дамоў 51 (1971). Сярэд. школа, Дом культуры, б-ка, аддз. сувязі, магазін. Помнік воінам-землякам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАСЦЕРАГА́ЛЬНАЕ ЎЗБРАЁННЕ, частка агульнага ўзбраення воінаў; засцерагальны баявы рыштунак, створаны для прыкрыцця розных частак цела воіна і (у мінулым) яго каня ад паражальнага дзеяння зброі (пераважна *халоднай зброі*) праціўніка.

З. ў. вядома з глыбокай старажытнасці (выдзеўбаныя з дрэва і плеценыя з прутоў шчыты, скураныя пасы, шапкі і інш.). У 2000—500 да н. э. было прыстасавана пераважна для засцярогі ад кідальнай зброі. У арміях Ст. Усходу, Кітая, Японіі і Індыі карысталіся скуранымі панцырамі, лускаватымі даспехамі з металу і інш., у Ст. Грэцыі — цэльнакаванымі (па форме торса) даспехамі і глыбокімі шлемамі з медзі і жалеза, круглымі шчытамі (8—4 ст. да н. э.). Найб. былі пашыраны кальчужныя даспехі (кальчуга — кашуля, сплеценая з некалькіх тысяч метал. кольцаў, змацаваных заклёпкамі). Паявіліся ў Асірыі і Ст. Егіпце і пашырыліся ў эпоху ранняга сярэдневякоўя на мусульманскім Усходзе (асабліва ў Персіі), у Ст. Русі (з 10 ст.), потым у Еўропе (11—13 ст.). Кальчужны-




Засцерагальнае ўзбраенне: *1* — асірыйскія пехацінцы; *3* — грэчаскі воін, 8 ст. да н. э.; *4* — рымскі воін, 1 ст. н. э.; *6* — японскі воін, 16—17 ст.; *7—8* — лускаваты і кальчужны даспехі заходнееўрапейскіх рыцараў 13 ст. Засцерагальнае ўзбраенне рускіх воінаў 16—17 ст.: *9* — бахцярац і кулачная шапка; *10* — кальчужны байдана і місюрка з барміцай; *11* — юшман і шышак; *12* — панцыр, «зярцалы» і шлем; *13* — кальчуга, «зярцалы» і шышак. Даспехі заходнееўрапейскіх рыцараў: *19, 20* — «гатычныя» пласцінчатыя даспехі, 15 ст.; *21* — рыфлёныя («максіміліянаўскія») даспехі, 1-я чвэрць 16 ст.; *23* — турнірныя даспехі для воіна і каня, 2-я пал. 16 ст.; *22* — паўдаспехі, канец 16 ст.; *30* — кіраса, 2-я пал. 19 ст. Шчыты: *14* — рандаш, 2-я пал. 16 ст.; *18* — павеза, 15 ст. Шлемы і каскі: *2* — грэчаскі шлем, 5 ст. да н. э.; *17—5* — шлем рымскага гладыятара, 1 ст. да н. э.; *15* — шышак, 16 ст.; *16* — «ерыхонка», 13 ст.; «ерыхонка», 1-я пал. 17 ст.; *24* — салад, 13—14 ст.; *25* — шлем з забралам, 15 ст.; *26*—салад, 15 ст.; *27* — каска-бургіньёт, 2-я пал. 16 ст.; *28* — каска-марыён, 16 ст.; *29* — каска кірасіра, 2-я пал. 19 ст.

пыл даспехі складаліся (з невялікімі варыяцыямі ў розных краінах) з кальчужнай кашулі, кальчужных нагавіц ці панчох, кальчужных рукавіц і капюшона (апошнія часта наглуха змацоўваліся з кашуляй; у Расіі замест капюшона выкарыстоўвалася барміца — заслона, якая прыкрывала шыю і плечы). У 15—16 ст. у Расіі і на Беларусі акрамя звычайных кальчуг былі пашыраны т. зв. панцыры (кальчугі з вельмі дробных кольцаў з густым пляценнем) і байданы (кароткія кальчугі з буйных плоскіх кольцаў; кальчуга 16 ст., знойдзеная ў Оршы, мае на кольцах некалькі тысяч надпісаў). У 16—17 ст. ужываліся і пласцініста-кольчатыя даспехі — бахцярцы (з кольцаў і выкладзеных верт. радамі дробных пласцінак) і юшманы (кальчуга з вял. пласцінамі); у 17 ст.— «зярцалы» (даспехі з фігурнага нагрудніка і спіны). Да З. ў. належаць метал. пояс, рукавіцы, шлем (паўкруглы адкрыты ці цыліндрычны глухі на Захадзе; у Расіі — шлемы вытнута-стральчатай формы, конусападобныя «ерыхонкі», шышакі; кулачныя шапкі — праштабаваныя, з ушытымі паміж слаямі метал. пласцінамі каўпакі з навушамі і інш.), наручы, панажы (бутурлыкі) і шчыты (на Захадзе розных формаў; у Расіі — кроплепадобныя, у 16—17 ст. пашыраны круглыя). З 2-й пал. 14 ст. у Еўропе паўсюдна пласціністыя латы («гатычныя даспехі»). Латы (з пласцін, выкаваных па форме частак цела) у 15 ст. з дапамогай рамянёў, шрубаў і шарніраў былі злучаны ў адно цэлае (поўныя даспехі). Адзеты ў латы рыцар засцерагаў галаву саладам (чашападобным шлемам з праразямі для вачэй і выцягнутым надпатылічнікам) ці глухім фігурным шлемам з забралам, якое падымалася. Шчыт быў заменены міндалепадобным шчытком на дрэўцы кап'я. Найб. цяжкімі даспехамі (больш за 40 *кг*) карысталіся для турніраў. З. ў. пехацінцаў у 15 ст. складалася з кальчугі ці кірасы (нагрудная брані) і салада. Ужываўся пастаўны шчыт (павеза). Удасканаленне халоднай зброі прывяло ў 1-й чвэрці 16 ст. да паўлення рыфлёнага («максіміліянаўскага») даспеха, укрытага жалабкамі для засцярогі ад уколаў. Часта латы ўпрыгожваліся дарагой чаканкай, разьбой, пакрываліся залатам, серабром. Мець такое З. ў. маглі толькі феадалы, якія ўзбройвалі таксама свае дружыны, цалаахоўнікаў. Развіццё агнястрэльнай зброі прымусіла стварыць латы з рыкашэтнымі паверхнямі (2-я чвэрць 16 ст.), а потым зусім адмовіцца ад поўных даспехаў, замяніўшы іх у 17 ст. паўдаспехамі з каскаю (бургіньёт, марыён, кабісэт, капеліна і інш.), пазней — кірасай, якая існавала як элемент парадная формы ў многіх арміях да пач. 20 ст. У сучасных арміях выкарыстоўваюцца стальныя шлемы (каскі), у некаторых (ЗША, Вялікабрытанія) — куленепрабіўныя камізэлькі. Індывідуальная брань уступіла месца калектыўнаму З. ў. ў выглядзе гарматных шчытоў, бронетранспарцёраў, танкаў і інш. Гл. таксама іл. да арт.

Літ.: Энгельс Ф. Избранные военные произведения, М., 1958, с. 179—205; [Висковатов А. В.]. Историческое описание одежды и вооружения российских войск, ч. 1—30, СПб., 1841—62; Равин Е. А. История военного искусства, т. 1—3, М., 1955—61; Арциховский А. В. Русское оружие X—XIII вв., у кн.: Доклады и сообщения исторического факультета МГУ, в. 4, М., 1946; Гордеев Н. В. Русский оборонительный доспех, у кн.: Государственная оружейная палата Московского Кремля, М., 1954; яго ж. Оружие, у кн.: Оружейная палата, М., 1964; Ларченко М. Н. Западноевропейское оружие XV—XVII веков в Эрмитаже, Л., 1963.

ЗАСЦЕРАГА́ЛЬНІК электрычны, прыстасаванне для аховы электрычных рухавікоў, апаратаў, прылад, праводкі ад перагрэву пры кароткім замыканні або перагрузцы. З. ставяць на гал. размеркавальным шчыце, на адгалінаваннях ад асн. ланцугоў праводкі, перад апаратамі (трансфарматары, рухавікі). У сілавых установоўках З. замяняюцца больш дакладнымі аўтам. выключальнікамі (гл. *Ахоўны электрычны аўтамат*).

Складаецца (гл. рыс.) з ізаляцыйнага корпуса (трубка або патрон) і плаўкай устаўкі (дрот або пласцінка з медзі, свінцу, сплаву свінцу з волавам і інш.). Слчэнне ўстаўкі разлічваецца так, каб яна пры току, большым за намінальны, плавілася і адключала установу. З. бываюць адкрытыя (устаўка размешчана звонку корпуса) і закрытыя. Пры невялікім (да 60 *а*) току нізкага напружання пашыраны коркавыя (разьбовыя) З. тыпаў Ц-14, Ц-27, Ц-33; для аховы сілавых установак з токам да 1000 *а* — трубчастыя (ПР-2, ІПН-2 і інш.). У высакавольтавых (да 110 *кв*) З. плаўкі элемент знаходзіцца ў трубцы, запоўненай кварцавым пяском (ПК-10, ПКТ-35 і інш.); разрыўная магутнасць іх да 1,5 млн. *ква*.



Трубчасты плаўкі засцерагальнік: *1* — нізменная частка; *2* — зменная частка (ізаляцыйная трубка); *3* — кантактавыя спружыны; *4* — плаўкі элемент.

Літ.: Сацункевич М. Ф. и Мехедко Ф. В. Справочник электротехника, Мн., 1969; Алексеев В. П. Высоковольтные и низковольтные предохранители, М., 1961.

ЗАСЦЯРО́ГА АД ЗБРО́І МАСАВАГА ПАРАЖЭ́ННЯ, комплекс мерапрыемстваў для зберажэння войск, насельніцтва, баявой тэхнікі і матэрыяльных сродкаў ад паражэння ядзернай, хімічнай і біялагічнай зброяй.

У войсках уключае: радыяцыйную, хім. і біял. разведку; апавяшчэнне пра радыяцыйнае, хім. і біял. заражэнне; разгрупаванне і маскіроўку войск і вайсковых аб'ектаў тылу; забеспячэнне сродкамі засцярогі; інж. абсталяванне раёнаў дыслакацыі войск; ліквідацыю вынікаў ужывання зброі масавага паражэння і інш. Засцярога насельніцтва: 1) ад ядзернай зброі — эвакуацыя з вялікіх гарадоў у вызначаныя зоны; укрыццё ў ахоўных збудаваннях людзей, што астаюцца ў горадзе; буд-ва процірадыяцыйных сховішчаў у загарадных зонах; *індывідуальныя сродкі засцярогі*; 2) ад хім. зброі — своечасовае выяўленне атрутных рэчываў; хуткае апавяшчэнне пра гэта насельніцтва; выкарыстанне індывідуальных і *калектыўных сродкаў засцярогі*; ліквідацыя ачагоў заражэння; 3) ад біял. зброі — своечасовае выяўленне біял. заражэння, індывідуальныя і калектыўныя сродкі засцярогі, строгі проціэпідэмічны рэжым, прафілактычныя і лячэбныя мерапрыемствы. Гл. таксама *Грамадзянская абарона*.


Літ.: Манец Ф. И. и др. Защита от оружия массового поражения, М., 1967; Зубкин А. С. Обеззараживание объектов, подвергшихся воздействию оружия массового поражения, 2 изд., М., 1970 (бібліягр.); Надиров Ю. С. и др. Защита подразделений от оружия массового поражения, М., 1968; Стерлин Р. Н., Зимин В. И. и Емельянов В. И. Химическое оружие и защита от него, М., 1968; Москалев А. Д. Радиоактивное излучение ядерного взрыва и защита от него, М., 1969; Важинов А. Г. Бактериальные средства и защита от них, М., 1969 (бібліягр.); Кузуб О. Ф. Основы защиты населения в ракетно-ядерной войне, Л., 1968. *В. А. Дзямідчык.* Мінск.

ЗАСЯДА́ЦЕЛЕЎ Вячаслаў Васілевіч (н. 14.3. 1923, в. Колпны Малаархангельскага пав. Арлоўскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1953. У Чырв. Арміі з 1942. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. У ноч на 27.9.1943 першы пераправіўся цераз Дняпро, выбіў ворага з траншэй і захапіў плацдарм. У баях за расшырэнне плацдарма камсорг роты старшы сяржант З. пяраз падымаў воінаў у контратакі. Служыць у Сав. Арміі.

ЗАТО́ЧНЫ СТАНО́К, металарэзны станок для заточкі, ператочкі і даводкі свердлаў,

зенкераў, фрэзаў і інш. рэзальнага інструменту.

Заточваюць інструмент абразіўнымі кругамі (гл. *Абразівы*); для даводкі карыстаюцца алмазнымі і баразонавымі кругамі. З. с. падзяляюцца на універсальныя, спецыялізаваныя і спецыяльныя. Найб. пашыраны універсальныя, на якіх заточваюць усе асн. віды рэзальнага інструменту; на іх таксама можна рабіць круглае і плоскае шліфаванне. Спе-



Паўаўтамат для заточкі працызійных чарвячных фрэзаў 3663П Віцебскага завода заточных станкоў імя XXII з'езду КПСС.

цыялізаваныя З. с. прызначаны для заточкі аднаго віду якога-н. стандартнага ці нармалізаванага інструменту. На спец. З. с. заточваюць звычайна нестандартны інструмент. На Беларусі З. с. высокай і асабліва высокай дакладнасці выраблене *Віцебскі завод заточных станкоў*, прадукцыя якога экспартуецца ў многія краіны свету. Асн. віды З. с. гэтага з-да: універсальныя (мадэлі 3В641, 3В642, 3Б643); станкі-паўаўтаматы для заточкі чарвячных фрэзаў (мадэлі 3А660В, 3А662, 3663, 3663П і 3664); станкі-паўаўтаматы для заточкі фрэзерных галовак (мадэлі 3682, 3А667, 3Б667 і 3669); станкі-паўаўтаматы для заточкі разцовых зубарэзных галовак (мадэлі 3А665, 3А666); станок для заточкі працяжак (мадэль 3601). Універсальна-заточны станок 3В642 і станок для заточкі чарвячных фрэзаў 3662 таксама выраблене *Віцебскі станкабудаўнічы завод* імя Кірава.

Літ.: Меницкий И. Д. и Каплан Ю. А. Универсально-заточные станки, М., 1968; Каратыгин А. М. и Коршунов Б. С. Заточка и доводка режущего инструмента, 2 изд., М., 1963; Кащук В. А., Молехин Д. А. и Бармин В. П. Справочник заточника, М., 1967.

В. П. Рэзнік.

ЗАТО́ЧЧА, вёска ў Жоўтінскім с/с Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Суворава. За 12 *км* на У ад Верхнядзвінска, 156 *км* ад Віцебска, 3 *км* ад чыг. ст. Свольна. 103 ж., гасп. 36 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін.

ЗАТУР'Я, вёска ў Юшавіцкім с/с Нясвіжскага р-на Мінскай вобл., на р. Тур'я. Цэнтр калгаса «Слава». За 16 *км* на ПнУ ад Нясвіжа, 128 *км* ад Мінска, 31 *км* ад чыг. ст. Гарадзея. 822 ж., двароў 250 (1971). Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін.

ЗАТУХА́ЛЬНЫЯ ВАГАННІ, вагальныя працэсы, *амплітуда* якіх памяншаецца на працягу часу ў выніку страты энергіі вагальнай сістэмай. Напр., эл. ваганні ў *вагальным контуры* затухаюць праз страту энергіі на нагрэванне эл. супраціўлення контура і на выпраменьванне эл.-магн. хваляў. Гл. таксама *Ваганні.*

ЗАЎГАРО́ДНІ Рыгор Дзямідавіч [27.10(9.11).1914, станіца Нованікалаеўская Таганрогскай акругі — 12.12.1955], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1941, камандзір артыл. батарэі. Вызначыўся ў вер. 1943 у Камарыпскім р-не Палескай вобл. Заглушыў агнявыя кропкі праціўніка, чым стварыў умовы для пераправы падраздзялення цераз Дняпро. У ноч на 30.9.1943 кіраваў пабудовай плытоў, на якіх пераправіў батарэю цераз раку, у баі на плацдарме адбіў некалькі контратак.

ЗАЎРЫЕ́Ў Віктар Рыгоравіч [н. 29.12.1907 (11.1.1908), Уфа], беларускі савецкі географ. Д-р геагр. н. (1959), праф. (1960). Чл. КПСС з 1942. Удзельнік Айч. вайны. Да 1961 працаваў у АН Азерб. ССР, з 1961 заг. кафедры фіз. геаграфіі зарубежных краін БДУ. Гал. кірунак навук. дзейнасці — тэорыя і практыка комплекснага фізіка-геагр. раянавання горных краін. Даследаваў фізіка-геагр. раёны і ландшафты Азерб. ССР, В'етнама, займаецца праблемаю Каспійскага м. і вусцямі рэк, якія ўпадаюць у яго, удзельнічаў у стварэнні Атласа Азерб. ССР. Віцэ-прэзідэнт Геагр. т-ва Беларускай ССР (з 1965). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.

Тв.: (У сааўт.) География Азербайджанской ССР, Баку, 1950 (на азерб. мове); (разам з Ш. Ф. Мехціевым) Азербайджан — сокровищница нефти, Баку, 1954; (разам з К. К. Гюлем) Физическая география Азербайджанской ССР, Баку, 1958; (у сааўт.) Толковый словарь географических названий Азербайджанской ССР, Баку, 1960 (на азерб. мове); По дорогам Вьетнама, Мн., 1968; (разам з В. Г. Велевым, Н. Т. Раманоўскім) Белоруссия, София, 1969.

ЗАЎШЫЧЫ, вёска ў Акцябрскім с/с Салігорскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога сацыялізма». За 20 *км* на ПнЗ ад Салігорска, 153 *км* ад Мінска. 1284 ж., двароў 357 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, 2 магазіны. У 1907 сяляне З. выступалі супраць царскіх улад. У 1944 вёску часткова спалілі нямецка-фашысцкія захопнікі, загубілі 27 мірных жыхароў.

ЗАХАВА́ННЯ ЗАКО́НЫ, фізічныя заканамернасці, якія ўстанаўліваюць пастаянства ў часе пэўных велічынь, што характарызуюць фіз. сістэму ў працэсе змены яе стану. З. з.— найб. фундаментальныя заканамернасці прыроды, яны вылучаюць самыя істотныя характарыстыкі сістэмы або працэсу з усёй сукупнасці з'яў. Фундаментальны характар велічынь, якія захоўваюцца, вынікае з самога факта іх пастаянства пры ўсіх зменах стану сістэмы. Таму такія велічыні адыгрываюць кардынальную ролю пры апісанні ўласцівасцей і паводзін кожнай сістэмы. Асабліва вял. значэнне З. з. звязана з тым, што дакладныя дынамічныя законы, якія поўнасцю апісваюць фіз. сістэмы, часта вельмі складаныя, а часам і невядомыя. У гэтых выпадках З. з. даюць магчымасць зрабіць шэраг важных вывадаў пра паводзіны і ўласцівасці сістэмы без рашэння асн. ураўненняў. Т. ч., роля З. з. павялічваецца з ускладненнем тэорыі. Факт існавання З. з. мае вял. значэнне, паколькі яны сцвярджаюць паяўнасць акрэсленай стабільнасці, нязменнасці ў бесперапыннай змянлівых з'явах прыроды. У гэтым іх важны метадалагічны і філасофскі сэнс.

Найб. універсальныя З. з. для *энергіі, імпульсу* (колькасці руху) і *моманту колькасці руху* (вугальнога моманту), а таксама для эл. зарада: яны

справядлівыя ў кожнай ізаляванай (замкнёнай) сістэме. З. з. энергіі ў мех. і цеплавых працэсах — адзін з трох асн. законаў тэрмадынамікі. Першы эксперыментальна адкрыты быў З. з. масы ў хім. рэакцыях (М. В. Ламаносаў, 1756; А. Л. Лавуазье, 1770). У спрадзіне 19 ст. Ю. Р. Маер, Дж. П. Джоўль і Г. Гельмгольц адкрылі *энергіі захавання іператварэння закон.* Фармулёўка адзінага ўсеагульнага З. з. ў прыродзе належыць Ламаносаву (1748). У працэсе развіцця навукі змест і сэнс некат. З. з. вельмі змяніліся. Так, у выніку стварэння *адноснасці тэорыі* страцілі сваё абсалютнае значэнне З. з. масы, паколькі яна, як высветлілася, залежыць ад скорасці і прапарцыянальная энергіі. Разам з гэтым З. з. энергіі і імпульсу аб'ядналіся ў агульны З. з. энергіі-імпульсу. Адкрыццё *спіну* — уласнага вярчальнага моманту мікрааб'ектаў — прывяло да ўдакладнення фармулёўкі З. з. моманту колькасці руху сістэмы. Асабліва вялікая роля З. з. у тэорыі элементарных часцінак, дзе ёсць шэраг абсалютных (для электрычнага, барыённага і лептоннага зарадаў) і прыблізных (для ізатапічнага спіну, дзіўнасці і інш.) З. з. Апошнія выконваюцца не ва ўсіх выпадках, а толькі пры некат. умовах. Напр., дзіўнасць захоўваецца ў моцных, але парушаецца ў слабых узаемадзеяннях (гл. *Адроны, Барыёны, Лептоны, Узаемадзеянні элементарных часцінак*). З. з. ў тэорыі элементарных часцінак асн. сродак вырашэння пытання пра тое, якія рэакцыі паміж часцінкамі магчымыя. Існуе глыбокая сувязь паміж З. з. і сіметрыяй фіз. сістэм (гл. *Сіметрыя*). Паводле агульнай тэарэмы Нётэр, наяўнасць сіметрыі ў сістэме выклікае існаванне некат. велічыні, якая захоўваецца. Напр., з адназроднасці прасторы-часу вынікае З. з. энергіі-імпульсу, а з ізатропнасці прасторы (незалежнасці ўласцівасцей ад кірунку) — З. з. вуглавога моманту.

Літ.: Фейнман Р. Характер физических законов, пер. с англ., М., 1968. *Ф. І. Фёдараў.* Мінск.

ЗАХА́РАВА Аляксандра Нічыпараўна [н. 9(22).3.1903, с. Палеўка Глухаўскага пав. Чарнігаўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну, дзярж. дзеячка БССР. З сялян. Чл. КПСС з 1928. Скончыла Пермскі пед. ін-т (1932). У 1923—38 настаўнічала. З 1938 на парт. рабоце ў Стаўрапольскім крайкоме, з 1940 лектар Беластоцкага абкома КП(б)Б. З люг. 1943 лектар Рагачоўскага падпольнага райкома КП(б)Б. З ліст. 1943 камісар партыз. 255-га палка Гомельскай вобл. З 1945 лектар, з 1947 нам. заг. аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б. У 1947—59 дырэктар Дома-музея І з'езду РСДРП, нам. старшыні Прэзідыума Вярх. Савета БССР. Дэп. Вярх. Савета БССР 2—4-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі. Жыве ў Мінску.

ЗАХА́РАВА Вольга Сцяпанаўна [н. 28.6(11.7).1908, ст. Яршова Саратаўскай губ.], руская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1955). Чл. КПСС з 1952. Скончыла Саратаўскі тэатр. тэхнікум (1932). Працавала ў т-рах Саратава, Грознага, Благавешчанска, Армавіра, Варонежа. У 1949—58 у Брэсцкім т-ры імя ЛКСМБ, у 1958—69 у Рускім т-ры БССР імя М. Горкага. Выканаўца характарных роляў. Лепшым з іх уласцівыя народнасць, сцэнічная культура. Сярод роляў: Ганна Ліхта («Змова асуджаных» М. Вірты), Паўлава («Старонка жыцця» В. Розава), Кабаніха («Навальніца» А. Астроўскага), Каліберава («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка) — у Брэсцкім т-ры; Матруна («Улада цемры» Л. Талстога), Антонаўна («Дзеці сонца» М. Горкага), Дзямідаўна («Нашэсце» Л. Лявонава) — у Рус. т-ры БССР.

ЗАХА́РАЎ Аляксей Міхайлавіч (1921, в. Навасёлкі Растоўскага пав. Яраслаўскай губ.— 14.9.1943), адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Вілейскай вобл. ў Айч. вайну. Канд. у чл. КПСС. У партызанах з 22.3.1942 — камандзір групы, атрада, удзельнічаў у стварэнні партыз. брыгады, з 22.5.1943 камандзір *партызанскай брыгады імя М. В. Фрунзе* Вілейскай вобл. Загінуў у авіякатастрофе.

ЗАХА́РАЎ Аляксей Нікіфаравіч (н. 24.2.1921, с. Нікольскае Данкоўскага пав. Разанскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра 26—27.6.1944 на Пн ад Магілёва. Кулямётным агнём прыкрываў пераправу пяхоты. Жыве ў Горкім.

ЗАХА́РАЎ Андрыян Дзмітрыевіч [8(19).8.1761, Пецярбург — 27.8(8.9).1811], рускі архітэктар. Вядомы прадстаўнік класіцызму. Вучыўся ў Пецярбургскай АМ (1767—82; акад. з 1794, праф. з 1797) і ў Парыжы ў Ж. Ф. Шальгрэна (1782—86). У канцы 18 — пач. 19 ст. распрацоўваў праекты перабудовы АН, планіроўкі і забудовы Правіянцкага в-ва, Галернага порта на Васільеўскім в-ве ў Пецярбурзе. Цэнтр. работа З.— поўная рэканструкцыя *Адміралцейства* (1806—23, закончана пасля яго смерці), аднаго з гал. ансамбляў Пецярбурга. У стварэнні гэтага шэдэўра рус. архітэктуры З. развіў лепшыя прыёмы, рус. класіцызму. Праектаваў і будаваў у многіх гарадах краіны, стварыў тыпавыя праекты казённых будынкаў для губернскіх і павятовых гарадоў (пошты, дамы губернатараў і інш.), што садзейнічала павышэнню маст. ўзроўню забудовы правінцыяльных цэнтраў. Творчасць З. мела вял. ўплыў на фарміраванне К. Росі, В. Стасава, А. Мельнікава.



Літ.: Гримм Г. Г. Архитектор Андреян Захаров. Жизнь и творчество, М., 1940; Аркин Д. Захаров и Воронихин, М., 1953.

ЗАХА́РАЎ Васіль Кірылавіч [11(23).8.1886, г. Ладзейнае Поле Алонецкай губ.— 12.3.1967], беларускі савецкі вучоны ў галіне лесаводства. Д-р с.-г. н. (1948), праф. (1926). Засл. дз. нав. БССР (1956). Скончыў Ленінградскі лясны ін-т (1923). Заг. кафедры лясной таксацыі і лесаўпарадкавання Бел. с.-г. акадэміі (1926—30), Бел. лесатэхн. ін-та (з 1930), Бел. тэхнал. ін-та (з 1961). Навук. працы па таксацыі лесу, рацыяналізацыі тэхнікі даследавання формы дрэўных ствалоў, па методыцы складання табліц аб'ёму, абегу і росту насаджэнняў. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам «Знак Пашаны».

Тв.: Методы промышленной сортиментации леса на корне, 2 изд., М.— Л., 1957; Новое в технике лесной таксации, М., 1966; Лесная таксация, 2 изд., М., 1967.

ЗАХА́РАЎ Георгій Няфёдавіч [н. 11(24).4.1908, с. Старое Сямёнкіна Бугурусланскага пав. Самарскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1929. У Чырв. Арміі з 1930. Лётчык. Вызначыўся пры вызваленні Віцебска, Оршы, Мінска, Гродна. Камандаваў дывізіяй, у склад якой уваходзіў полк «Нармандыя — Нёман». Збіў 18 варожых самалётаў. Жыве ў Маскве.

ЗАХА́РАЎ Георгій Фёдаравіч [23.4(5.5).1897, с. Шылава Камышынскага пав. Саратаўскай губ.— 26.1.1957], генерал арміі (1944), удзельнік вызвалення Беларусі ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1919. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1933), Акадэмію Ген. штаба (1939). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік 1-й сусв. і грамадз. войнаў. У Айч. вайну на Бранскім, Зах., 2-м і 1-м Бел., 4-м Укр. франтах: нач. штаба арміі, нам. камандуючага, камандуючы франтоў. У чэрв. 1944 у час вызвалення Беларусі камандуючы войск 2-га Бел. фронту, з лютага 1945 нам. камандуючага войск 1-га Бел. фронту. Удзельнік баёў пры прарыве варожай абароны на р. Міус і Малочная, вызвалення Крыма, фарсіравання Дуная і штурму Будапешта. Пасля вайны камандуючы войск ваен. акруг. У 1950—54 нач. курсаў «Выстрал», нам. нач. Гал. ўпраўлення падрыхтоўкі сухапутных войск. Узнаг. ордэнам Леніна, 9 інш. ордэнамі, медалямі.



ЗАХА́РАЎ Іван Антонавіч [6(18).9.1898, ст. Сямёпава Пакроўскага пав. Уладзімірскай губ.— 19.3.1944], дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1926. Скончыў Прамакадэмію лёгкай прамысл. СССР (1937). З 1914 сталяр. У 1919—23 у Чырв. Арміі, удзельнік грамадз. вайны. З 1926 на парт. і гасп. рабоце ў Маскоўскай вобл. У 1937 дырэктар ільнопрадзільнай ф-кі, потым старшыня гарвыканкома ў Віцебску. З крас. 1938 нам. старшыні СНК БССР. У Айч. вайну выконваў даручэнні ЦК КП(б)Б і БШПР па кіраўніцтве партыз. рухам на Беларусі. На XVII з'ездзе КП(б)Б выбіраўся канд. у чл., на XVIII — чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 1-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі. Імем З. названа вуліца ў Мінску.

ЗАХА́РАЎ Іван Кузьміч [н. 30.7(12.8).1909, в. Ганевічы Барысаўскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). З сялян. Чл. КПСС з 1937. Скончыў Вышэйшую камуніст. с.-г. школу імя Леніна ў Мінску (1934), партшколу пры ЦК КП(б)Б (1948). Працаваў старшынёю сельсавета, дырэктарам МТС у Асвейскім р-не. У кастр. 1941 накіраваны ў тыл ворага. У крас. 1942 арганізаваў і ўзначаліў атрад,



ператв. ў ліп. 1942 у *партызанскую брыгаду Асвейскую* імя Фрунзе. Камандзір брыгады З. адначасова (з ліп. 1942) сакратар Асвейскага падпольнага РК КП(б)Б. З ліп. 1944 на парт. рабоце ў Дрысенскім, Докшыцкім р-нах Полацкай вобл. У 1953—63 старшыня Рэсп. к-та прафсаюза рабочых буд-ва і прамысловасці буд. матэрыялаў. Жыве ў Мінску.

ЗАХА́РАЎ Канстанцін Фёдаравіч (крас. 1919, г. Іванава — 13.1.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1937. Камандзір авіяэскадрыллі знішчальнікаў. Зрабіў 190 баявых вылетаў, збіў 15 варожых самалётаў. 13.1.1944 у паветр. баі нападалёку ад Мазыра накіраваў падбіты самалёт на варожую калону.

ЗАХА́РАЎ Мацвей Васілевіч [н. 5(17).8.1899, в. Войлава Старыцкага пав. Цвярской губ.], савецкі ваенны дзеяч, Маршал Сав. Саюза (1959). Герой Сав. Саюза (1945). Герой ЧССР (1970), праф. (1948). З сялян. Чл. КПСС з 1917. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1928), аператыўны ф-т гэтай акадэміі (1933), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1937). У Чырв. гвардыі з крас. 1917. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі, штурму Зімняга палаца, грамадз. вайны на Паўд. фронце і Паўн. Каўказе. З 1928 у штабе ВВА. У 1937—41 нач. штаба Ленінградскай і Адэскай ваен. акруг, памочнік начальніка Генеральнага штаба РСЧА. У Айч. вайну нач. штаба арміі і нач. штаба Галоўнакамандуючага Паўн.-Зах. напрамку, нач. штаба Калінінскага, Рэзервовага, Сцяпнога, 2-га Укр. і Забайкальскага франтоў. Удзельнік абароны Ленінграда, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Малдавіі, Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі, разгрому яп. арміі на Д. Усходзе. З 1945 нач. Ваен. акадэміі Ген. штаба, нач. Гал. ўпраўлення Ген. штаба, гал. інспектар Сав. Арміі, камандуючы войск Ленінградскай ваен. акругі, галоўнакамандуючы Групы сав. войск у Германіі. У 1960—63 і з 1964 нач. Ген. штаба, першы нам. міністра абароны СССР. На XXII—XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета СССР 4—8-га скл. Узнаг. 5 ордэнамі Леніна, ордэнам Кастр. Рэвалюцыі, 10 інш. ордэнамі, медалямі, ордэнамі замежных краін.



Тв.: О научном подходе к руководству войсками, М., 1967.

Літ.: Грязнов В. З. Дорогой солдата, Л., 1968. *У. А. Пурын.* Масква.

ЗАХА́РАЎ Пётр Прохаравіч [4(16).1.1896, в. Ермакі Давінскага пав. Віцебскай губ.— 1.7.1953], удзельнік грамадз. вайны, ген.-м. інтэнданцкай службы (1942). З сялян. Чл. КПСС з 1942. У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1918. У снеж. 1918 — снеж. 1921 на Зах. фронце, удзельнік барацьбы з бандытызмам у Слуцкім і Бабруйскім пав.— ваен. камісар аддзела штаба брыгады і дывізіі. У 1930—41 у Ваен.-гасп. упраўленні РСЧА. У Айч. вайну на Зах. і 3-м Прыбалт. франтах. З 1945 да 1952 у Гал. інтэнданцкім упраўленні Мін-ва абароны СССР. Узнаг. ордэнам Леніна, 6 інш. ордэнамі, медалямі.

ЗАХА́РАЎ Расціслаў Уладзіміравіч [н. 25.8(7.9).1907, Астрахань], рускі савецкі балетмайстар і оперны рэжысёр. Нар. арт. СССР (1969). Д-р мастацтвазнаўства (1970), праф. (1951). Чл. КПСС з 1951. Скончыў харэагр. вучылішча (1926) і тэатр. тэхнікум (1932) у Ленінградзе. У 1936—56 балетмайстар і рэжысёр Вял. т-ра СССР. Сярод балетных пастановак у розных т-рах: «Бахчысарайскі фантан» Б. Асаф'ева (пачатак сав. харэагр. «пушкініяны»), «Медны коннік» Р. Глізра, «Золушка» С. Пракоф'ева (у Бел. т-ры оперы і балета ў 1964 і 1969). Творчасці З. ўласцівыя распрацоўка ідэйна-значных сюжэтаў, паглыбленне ўвагі да акцёрскага і рэж. майстэрства, умацаванне ролі драматургіі, сродкаў рэаліст. характарыстыкі балетных вобразаў. Дзярж. прэміі СССР 1946 і 1949. Узнаг. 2 ордэнамі.

Тв.: Искусство балетмейстера, М., 1954.

ЗАХА́РАЎ Сяргей Сцяпанавіч [н. 18.9(1.10).1901, в. Сямёнкава Пакроўскага пав. Уладзімірскай губ.], беларускі савецкі вучоны ў галіне земляробства. Д-р с.-г. н. (1958), праф. (1959). Засл. дз. нав. БССР (1965). Чл. КПСС з 1939. Скончыў с.-г. акадэмію імя Цімірязева (1931). З 1933 у Бел. с.-г. акадэміі. У 1942—44 дырэктар Ін-та сацыяліст. с. гасп. АН БССР. Дэкан аграномічнага ф-та (1950—51), прарэктар па навуч. рабоце (1951—53), заг. кафедры земляробства ў Бел. с.-г. акадэміі (з 1954). Асн. працы па вывучэнні эфектыўнасці севазваротаў з выкарыстаннем травасеяння, прамежкавых культур, сідэратаў, ванны і сістэм гербіцыдаў. Даследаваў эфектыўнасць папяроднікаў асн. с.-г. культур і папараў ва ўмовах БССР. Дэп. Вярх. Савета БССР 1-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

Тв.: Занятый пары і рацыянальнае іх выкарыстанне, Мн., 1960; Основы земледелия, Мн., 1963; Земледелие Западной и Северо-Западной зон СССР, М., 1967.

ЗАХА́РАЎ Уладзімір Мікалаевіч (н. 15.4.1931, в. Сокарава Бешанковіцкага р-на Віцебскай вобл.), беларускі савецкі вучоны ў галіне тэрапіі. Д-р мед. н. (1970). Чл. КПСС з 1961. Скончыў Мінскі мед. ін-т (1955). Працаваў у Мінску, Краснаярску, Маскве. Дацэнт 1-й кафедры тэрапіі Бел. ін-та ўдасканалення ўрачоў (1971). Асн. працы па пытаннях паталогіі сардэчна-сасудзістай сістэмы, зменах печані пры хранічнай алкагольнай інтаксікацыі.

Тв.: О диагностике узелкового периартериита, «Клиническая медицина», 1967, № 1; О клинико-функциональном состоянии печени при хронической алкогольной интоксикации, «Советская медицина», 1968, № 3; Экскурсия нижнего края печени в норме и при патологии, «Клиническая медицина», 1969, № 1.

ЗАХА́РАЎ Уладзімір Рыгоравіч [5(18).10.1901, руднікі пры Багадухаўскай Балцы, Данбас — 13.7.1956], рускі савецкі кампазітар. Нар. арт. СССР (1944). Чл. КПСС з 1944. Скончыў Данскую кансерваторыю (Растоў-на-Доне) у 1927. У 1932—56 муз. кіраўнік Рус. нар. хору імя Пятніцкага, для якога напісаў шмат песень («Уздоўж вёскі», «Праводзіны», «Зялёнымі прасторамі», «Ой, туманы мае», «Руская красуня» і інш.), характэрных наватарскім спалучэннем рысаў сав. масавай і традыц. сялянскай песні. Дзярж. прэміі СССР 1942, 1946 і 1952. Узнаг. ордэнам Леніна, ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

Літ.: Ливанова Т., В. Г. Захаров, М., 1954; Воспоминания о В. Г. Захарове, М., 1967.

ЗАХА́РАЎ Якаў Захаравіч [12(25).10.1907, в. Логава Веліжскага пав. Віцебскай губ.— 2.7.1955], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Віцебскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1931. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1950). У Чырв. Арміі з 1929. У партызанах з 1941 — камандзір групы, атрада, нач. штаба брыгады, з кастр. 1942 камандзір *партызанскай брыгады 1-й Беларускай* Віцебскай вобл., з 26.10.1943 у рэзерве БШПР. У 1944—55 на парт. рабоце. Узнаг. 2 ордэнамі, медалямі.

ЗАХА́РЫЧЫ, вёска ў Юравіцкім с/с Полацкага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр саўгаса імя Жыжова. За 8 *км* на ПнУ ад Полацка, 107 *км* ад Віцебска. 174 ж., гасп. 68 (1971). Швейная майстэрня камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, фельч.-ак. пункт, адд. сувязі, сталовая, 2 магазіны.

ЗАХА́РЭВІЧ Марыя Георгіеўна (н. 28.11.1936, в. Навасёлкі Ашмянскага пав. Віленскага ваяводства), беларуская савецкая актрыса. Засл. арт. БССР (1967). Чл. КПСС з 1967. Пасля заканчэння Бел. тэатр.-маст. ін-та (1957, педагог К. Саннікаў) у т-ры імя Я. Купалы. Выканаўца драм. і характарных роляў. Сярод іх: Галя Жураўка («Пакуль вы маладыя» І. Мележа), Любоў («Любоў, Надзея, Вера» П. Васілеўскага), Зося Савіч («Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна), Верачка, Ліза Хрэнава («Перад вячэрай», «Традыцыйны збор» В. Розава), Ганна («На дне» М. Горкага), Браент («...Праўду! Нічога, акрамя праўды!!!» Д. Аля), Кацярына Міхайлаўна («Памяць сэрца» А. Карпейчука). Ролі ў тэлевізійных пастаноўках: Сата («Трывожнае шчасце» паводле Шамякіна), Эма («Ткачы» Г. Гаўптмана).

ЗАХІДАВА Лютфі (н. 6.11.1925, г. Канібадам Хаджэнцкай акругі Узб. ССР), таджыкская савецкая артыстка балета. Нар. арт. СССР (1957). Чл. КПСС з 1957. З 1941 салістка Тадж. т-ра оперы і балета імя Айні. Першая балерына-таджычка, якая авалодала тэхнікай класічнага балета. З роляў: Дыльбар («Дыльбар» А. Леніскага), Лейлі («Лейлі і Меджн-

пун» С. Баласаняна), Золушка («Золушка» С. Пракоф'ева), Адэта («Лебядзінае возера» П. Чайкоўскага). Вядомая і як выканаўца тадж. нар. танцаў. Дзярж. прэмія СССР 1949.

ЗАХІР-ШАХ Мухамед (н. 15.10.1914), кароль (падзішах) Афганістана. Вучыўся ў Кабуле (1920—24), у Францыі (1924—30). У 1931 скончыў Кабульскае ваен. вучылішча. У 1932 нам. міністра нац. абароны, у 1933 выконваў абавязкі міністра асветы. Пасля смерці бацькі, караля Мухамеда Надзір-шаха — кароль (з ліст. 1933).

ЗАХО́ДНЕ-БЕЛАРУ́СКАЯ ПРАВІ́НЦЫЯ, фізіка-геаграфічная тэрыторыя, якая цягнецца клінам ад зах. граніцы БССР на ўсход. Уключае Капыльскую граду. З ПнУ акаймоўваецца адгор'ямі Ашмянскага і Мінскага ўзв., на Пд мяжуе з Палессем па лініі Брэст — Слуцк. У адм. адносінах сюды ўваходзяць амаль уся Гродзенская вобл., паўн. частка Брэсцкай і заходняя Мінскай абл. Фізіка-геагр. раёны (паводле В. А. Дзяменцьева): *Паўднёва-Заходняе адгалінаванне Беларускай грады, Капыльская града, Лідская раўніна, Баранавіцкая раўніна, Прыбугская раўніна, Сярэдненёманская нізіна, Верхнянёманская нізіна.*

У рэльефе выдзяляюцца спалучэнні марэнных узвышшаў паўд.-зах. адгалінавання Беларускай грады, донамарэнныя раўніны, водналедавіковыя і прыледавіковыя нізіны. Найвыш. пункт на Навагрудскім узв. г. Замкавая (Пуцэвіцкая), 323 *м* над узр. м.; самае нізкае месца 85 *м* над узр. м. на ПнЗ правінцыі, у даліне Нёмана. У геал. адносінах тэр. З.-Б. п. займае зах. частку Беларускага крышталічнага масіву і паўн.-зах. частку Брэсцкай упадзіны. Адклады мелавога, неагенавага і палеагенавага ўзросту перакрываюцца чацвярцічнымі (марэннымі, водналедавіковымі, азёрнымі, рачнымі, лёсападобнымі).

Карысныя выкапні: цагельная і цэментавая гліны, мел, мергель, пясчана-жвіровы матэрыял, торф. Каля Карэліч і Шчучына выяўлены паклады жал. рудаў. Клімат умерана цёплы, вільготны. Сярэдняя т-ра ліп. 17,5—18,5, студз. да —6 °С. Вегет. перыяд 190—205 дзён. Ападкаў 550—650 *мм* за год. Найбольшая рака З.-Б. п. Нёман з прытокамі: Бярэзіна, Гаўя, Дзітва, Котра (справа), Моўчадзь, Шчара, Зальвянка, Рось, Свіслач (злева). На ПдЗ рэкі Лясная і Нараў (бас. Буга). Азёраў мала, найбольшае воз. Белае. На ўзвышшах і раўнінах глебы дзярнова-падзолістыя сярэдне- і моцнаападзоленыя на марэнных суглінках і супесях, на лёсападобных пародах. У нізінах пераважаюць дзярнова-слабаападзоленыя глебы на пясках, а таксама забалочаныя і тарфяна-балотныя; алювіяльна-лугавыя ў абалонах рэк. Пад ворнымі землямі каля 40% тэр. Шыракаліста-яловыя і хваёвыя лясы, хмызнякі, сухадолы і нешырокія палосы заліўных лугоў сярод узвышшаў і на раўнінах. На нізінах пераважаюць хваёвыя бары, драбналістыя і забалочаныя лясы, нізінныя балоты. Асталіся буйныя лясныя масівы: Белавежская, Налібоцкая і Ліпічанская пушчы. Аб'яўлены дзяржаўным ландшафтным заказнікам воз. Свіцязь і навакольлі. Сярод таежных прадстаўнікоў пашыраны жывёлы, уласцівыя еўрап. мяшаным лясам (зубр, высакародны алень, лань, бабёр, заяц-русак і інш.). Са стэпавых грызуноў траляцца рабы суслік; з птушак водзяцца чыроны каршун, сіпуха і чорны бусел.

Літ.: Дзяменцьеў В. А., Шкляр А. Х. і Якушка В. П. Природа Беларусі, Мн., 1959.
В. П. Якушка. Мінск.

ЗАХО́ДНЕДЗВІ́НСКАЯ ВАЕ́ННАЯ ФЛАТЫ́ЛІЯ. Створана 26.11.1919, гал. база — Віцебск. Ахоўвала чыг. масты і інш. аб'екты ў верхнім і ніжнім цячэнні Зах. Дзвіны, змагалася з белагвардз. бандамі, памагала перавозіць войскі, ажыццяўляла іх забеспячэнне, вяла разведку праціўніка. У сак. 1920 мела 32 баявыя адзінкі — рачныя канаперкі, узброеныя маторныя катэры, плывучыя батарэі і інш. У склад флатыліі ўваходзіў дэсантны атрад маракоў з прыдадзенымі яму артыл. сродкамі. Расфарміравана ў 1920.

Літ.: Боевой путь Советского Военно-Морского Флота, М., 1967.
Я. Я. Чарняк. Ленінград.

ЗАХО́ДНЕЕЎРАПЕ́ЙСКІ САЮ́З (ЗЕС), аб'яднаньне ваен.-паліт. групоўка з 7 еўрап. краін: Вялікабрытаніі, Францыі, ФРГ, Італіі, Бельгіі, Нідэрландаў і Люксембурга.

Створана ў маі 1955 паводле *Парыжскіх пагадненняў 1954.* Тэрмін дзеяння да 1998. У рабоце гал. органа саюза ўдзельнічаюць як наглядальнікі прадстаўнікі ЗША і Канады. Групоўка цесна звязана з агрэс. *Арганізацыяй паўночнаатлантычнага дагавору* (НАТО), якой падпарадкаваны ўсе ваен. сілы саюза. Разам з інш. імперыял. блокамі ЗЕС яднае рэакц. сілы для барацьбы супраць сацыяліст. краін, а таксама супраць народаў, якія вызваліліся ад калан. панавання і сталі на шлях незалежнага паліт. і сац. развіцця. У складзе ЗЕС атрымала магчымасць неабмежавана нарошчваць ваен.-прамысл. магутнасць ФРГ. Меры для прадухілення новай пагрозы герм. мілітарызму, вызначаныя пры стварэнні саюза, фармальныя. Т. зв. Агенцтва па кантролі над узбраеннем мае вялікія правы. Паміж удзельнікамі саюза існуюць супярэчнасці пры вырашэнні кардынальных паліт., міжнар. і ваен. праблем. Але ЗЕС застаецца агрэс. групоўкай, дзейнасць якой пагражае інтарэсам бяспекі народаў свету.

ЗАХО́ДНЕСІБІ́РСКАЯ РАЎНІ́НА (нізіна), адна з найбольшых у свеце. Размешчана паміж Уральскімі гарамі на З, Енісеем на У, Карскім м. на Пн, Тургайскім плато, Казахскім драбнасопачнікам і Алтайскімі гарамі на Пд. Цягнецца з Пн на Пд 2500 *км*, з З на У ад 1000 *км* (на Пн) да 1900 *км* (на Пд). Пл. амаль 3 млн. *км*².

У аснове раўніны — Зах.-Сібірская пліта, перакрытая магутнымі мезазойскімі і кайназойскімі адкладамі, якія ў сваю чаргу ўкрыты алювіяльнымі, ледавіковымі, азёрнымі і марскімі (на Пн) пародамі чацвярцічнага ўзросту. Карысныя выкапні: нафта і газ на Пн і ў сярэднім цячэнні Ові, буры вугаль, торф (1-е месца ў СССР па запасах), жал. руда, буд. матэрыял. У азёрах на Пд вял. запасы соды, спажыўной і глаўберавай солі. Рэльеф раўніны. Самыя нізкія ўчасткі ў цэнтры і на Пн (выш. 50—150 *м* над узр. м.), уздоўж зах. і ўсх. ускраін невялікія (200—250 *м*) узвышшы. У сярэдняй частцы нізіны ад Урала да Енісея цягнуцца Сібірскія ўвалы выш. да 285 *м*. Шырокія плоскія міжрэчныя і рачныя далiны вельмі забалочаныя (найбольшы балотны масіў Васюганне). Клімат кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад —25 на Пн да —18 на Пд, ліп. адпаведна ад 4 да 22 °С. Ападкаў за год 200 *мм* на Пд, 250 *мм* на Пн, 500 *мм* і больш у цэнтр. ч. Вегет. перыяд каля 100 дзён на Пн, 175 на Пд. Гал. рэкі Енісей і Об з шматлікімі прытокамі (агульная даўж. 250 тыс. *км*), выкарыстоўваюцца як суднаходныя і сплаўныя магістралі. Многа азёраў розных паходжання (найб. Чаны, Убінскае, Кулундзінскае). Паўн. ч. занята тундрай (глебы глеевыя і глеева-падзолістыя), якая пераходзіць у лесатундру (глебы падзоліста-глеевыя), далей на Пд хвойныя лясы (глебы падзолістыя). На Пд лесастэп з асінавабярозавымі галмі-калкамі (глебы чарназёмныя), які пераходзіць у стэп (глебы чарназёмныя і каштанавыя, часта засоленыя). Лесам занята больш як 60 млн. *га*, запасы драўніны каля 9 млрд. *м*³. Жывёльны свет вельмі багаты і разнастайны.

Літ.: Белорусов Д. В. Будущее Западно-Сибирской низменности, М., 1968; Новые данные по геологии и полезным ископаемым Западной Сибири. Сб. ст., в. 4, Томск, 1969; Абрамович Д. И. и др. Западно-Сибирская низменность. Очерк природы, М., 1963.
А. Х. Шкляр. Мінск.

ЗАХО́ДНІ БУГ, гл. *Буг.*

ЗАХО́ДНІ КАМІТЭ́Т 1862—65, спец. ўстанова, утвораная 20.9.1862 у Пецярбурзе рускім царызмам для распрацоўкі мерапрыемстваў на задушэнні вызв. руху на Беларусі, у Літве і Правабярэжнай Украіне.

У склад З. к. ўваходзілі старшыня к-та — старшыня К-та міністраў кн. П. П. Гагарын, члены — шэф жандараў, міністры: замежных спраў, ваен., юстыцыі, унутр. спраў, фінансаў, нар. асветы, дзярж. маёмасцей, обер-пракурор Сінода; у рабоце ўдзельнічалі віленскі і кіеўскі ген.-губернатары. Меў шырокія паўнамоцтвы, але не здолеў папярэдзіць паўстанне 1863 і ў студз. 1865 скасаваны.

Літ.: Валуев П. А. Дневник П. А. Валуева министра внутренних дел, т. 1, М., 1961; Середонин С. М. (сост.). Исторический обзор деятельности Комитета министров, т. 3, ч. 1, СПб., 1902.
Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

ЗАХО́ДНІ ПАКІСТА́Н, адна з дзвюх правінцый Пакістана. Знаходзіцца на адлегласці 1600 *км* ад Усх. Пакістана. Пл. 807,0 тыс. *км*², нас. 56 млн. чал. (1968). Адм. ц. Лахор. Падзяляецца на 12 абласцей, 46 акруг і 196 раёнаў; 6 асобных тэрыторый.

Паводле рэльефу З. П. дзеліцца на горную і раўнінную часткі. На Пн адгор'і Гімалаяў і Гіндукуша выш. да 5—7 тыс. *м* (г. Тырычмір, 7690 *м*). Схілы стромкія, скалістыя, парэзаныя глыбокімі цяснінамі. Перавалы на выш. 3800—4600 *м* над узр. м., даступныя 3—5 месяцаў у год. На З — Сулеймановы горы, хрыбты Макрана, нагор'е Белуджыстана. Між хрыбтамі далiны з унутраным сцёкам. На У ад горных раёнаў раўніна р. Інд. На граніцы з Індыяй пустыня Тар. Карысныя выкапні: кам. вугаль, храміты, нафта, кам. соль, буд. матэрыялы. Клімат сухі, трапічны на Пд, субтрапічны на Пн. Т-ра паветра на раўніне Інда ад 10 да 20 °С у студз., ад 30 да 40 °С у ліп. — жн. Ападкаў 250—750 *мм* за год. Галоўная р. Інд з прытокамі Панджнад, Кабул і інш. Выкарыстоўваецца на арашэнне. Глебы пераважна пустынныя і паўпустынныя шэраземы, у перадгор'ях — каштанавыя і бураземы. Ёсць голыя пяскі, месцамі салончакі. Уздоўж рэк урадлівыя алювіяльныя глебы. Расліннасць паўпустынная і пустынная: вярблюджая калючка, салянкі, палыны і інш.; на схілах гор — ядловец, астрагал, чый. Лясы асталіся ярэдку ў гарах. Жывёльны свет разнастайны: персідская газель, дзікія казлы, бараны і аслы; шакалы, гіены і інш. Шмат птушак і насякомых. Палова насельніцтва — пенджабцы разам з блізкімі ім народамі групы лахнда. Жывуць сіндхі, пуштуны (патаны), белуджы, брагуі і інш. Дзярж. мова урду (гаворыць большасць пенджабцаў і часткова сіндхі) і англійская. Амаль усе вераюць мусульмане-суніты. Сярэдняя шчыльн. 69,5 чал. на 1 км². Большая частка насельніцтва сканцэнтравана ў раўнінных арашаных раёнах (Пенджаб на Пн, Сінд на Пд), дзе шчыльн. да 500—1000 чал. на 1 км². Тут жа і найбольшыя гарады (тыс. ж., 1969): Карачы — 3060; Лахор — 1823; Хайдарабад — 698; Мултан — 597; Лаялпур, Равалпіндзі. Новая сталіца краіны Ісламабад.

З. П. больш развітая ў эканам. адносінах частка краіны. Дае ³/₄ прамысл. прадукцыі Пакістана (1968). Але доля прамысловасці ў нац. даходзе ў 8—9 разоў меншая, чым с. гасп. Асн. галіна — земляробства. Каля паловы земляў (асабліва арашаных) належыць

памешчыкам. Вырошчваюць пшаніцу, проса, кукурузу, ячмень, бавоўнік. Жывёлагадоўля пераважна качавога характару. Прамысловасць уключае асобныя горназдабыўныя, металургічныя, маш.-буд., нафтаперапр., гарбарныя, шкларобныя, цэментавыя, цукровыя прадпрыемствы. Больш развіта тэкст., харч., папяровая прамысловасць, саматужная вытворчасць. Развіты чыг. і аўтамаб. транспарт, рачное суднаходства. Знешнія сувязі пераважна праз порт Карачы. Зносіны з Усх. Пакістанам марскім шляхам вакол Індыі і з дапамогай авіяцыі. Гл. таксама *Пакістан.*

Літ.: Пуляркин В. А. Западный Пакистан, М., 1962; Пакистан, М., 1966. *І. Я. Афнагель.* Мінск.

ЗАХО́ДНІ РАЁН АБАРО́НЫ, створаны на аснове загаду Галоўкома ад 11.9.1918. Нач. А. Я. Снесараў. Меў Рэўваенсавет. Штаб — у Маскве.

У склад З. р. а. ўваходзілі атрады і часці Чырв. Арміі, размешчаныя на *Заходнім участку атрадаў заслоны.* Задачы: абарона граніц ад Петраграда да Чэрыкава, Клімавіч і Рослаўля, вызваленне сав. тэрыторыі ад ням. акупацыйных войск, згрупаванне ўсіх атрадаў у буйныя баявыя адзінкі. Паводле загаду Рэўваенсавета Рэспублікі 15.11.1918 перайменаваны ў Заходнюю армію ў складзе Заходняй, Пскоўскай і Віцебскай дывізій.

ЗАХО́ДНІ САЯ́Н, горная сістэма на Пд Краснаярскага краю і ў Тувінскай АССР. Цягнецца ў паўн.-ўсх. кірунку ад вярхоўяў р. Абакана да стыку з Усх. Саянам. Даўж. больш за 650 *км*, шыр. ад 80 да 200 *км*. Складаецца з вузкіх хрыбтоў, падзеленых глыбокімі рачнымі далінамі і міжгорнымі катлавінамі. Выш. 2000—2500 *м*, найвыш. пункт г. Кызыл-Тайга (3121 *м*). Ёсць сляды стараж. абледянення. Складзены з пясчанікаў, крышталічных сланцаў, вапнякоў, кангламератаў, прарваных інтрузіямі гранітаў і дыярытаў. Радовішчы жалезных і медных рудаў, азбесту, ртуці, золата.

Клімат рэзка кантынентальны. Сярэдняя т-ра студз. ад —20 (на схілах гор) да —30 °С (у катлавінах); ліп. 10—12 (на схілах гор), 17—20 °С (у катлавінах). Ападкаў 800—1200 *мм* на паўн. схілах, на паўд. да 300 *мм* за год. Рэкі належаць да бас. Енісея, які пераразае З. С. з Пд на Пн. Расліннасць залежыць ад вышынной пояснасці і экспазіцыі схілаў. На паўн. схілах унізе хваёва-лісцевыя лясы. З 800 да 1800 *м* цёмнахвойныя лясы пераходзяць у рэдкалессе. Вышэй мохава-лішайнікавая і камяністая тундра. На паўд. сухіх схілах да выш. 1200—1500 *м* горны лесастэп з лістоўніцаю. У катлавінах палынна-злакавы стэп. У тайзе водзяцца лось, марал, казуля, буры мядзведзь, рысь, собаль, вавёрка; у стэпах — грызуны.

Літ.: Михайлов Н. И. Горы Южной Сибири, М., 1961.
А. Н. Андрушчанка. Мінск.

ЗАХО́ДНІ ЎЧА́СТАК АТРА́ДАЎ ЗАСЛО́НЫ. Сфарміраваны на аснове загаду Вышэйшага ваен. савета ад 9.3.1918 для абароны зах. граніц Сав. Рэспублікі.

У склад З. ў. а. з. ўваходзілі Невельскі, Віцебскі, Аршанскі, Смаленскі, Рослаўскі, Бранскі і Курскі атрады Чырв. Арміі (гл. таксама *Заслона*). На чале стаяў Ваенны савет, які складаўся з ваен. кіраўніка У. М. Ягор'ева і двух, а з 29.8.1918 трох ваен. камісараў. Перафарміраваны на аснове загаду Галоўкома ад 11.9.1918 у *Заходні раён абароны.*

ЗАХО́ДНІ ФРО́НТ 1915—18 у 1-ю сусветную вайну. Утвораны 12 жн. 1915 у сувязі з рэарганізацыяй Паўночна-Заходняга фронту на Паўночны і Заходні. З. ф. прыкрываў Маскоўскі стратэгічны кірунак і быў

важнейшым участкам ваен. дзеянняў. Штаб фронту знаходзіўся ў Мінску. Тылавыя часці размяшчаліся ў Смаленску, Вязьме, Ржэве, Дарагабужы, Рослаўлі, Калузе, Бранску, Гомелі, Оршы. З. ф. разам з тыламі на пачатак 1917 займаў усх. раёны Беларусі, частку Літвы, Смаленскую, Калужскую і частку Чарнігаўскай губ. У тыле З. ф. (Магілёў) размяшчалася Стаўка вярх. галоўнакамандуючага.

Галоўнакамандуючыя: ген.-ад'ютант А. Е. Эверт, з 22.3.1917 ген. ад кавалерыі В. І. Гурка, з 8.6.1917 ген.-л. А. І. Дзянікін, з 4.8.1917 ген. ад інфантэрыі П. С. Балуеў; камісар Часовага ўрада В. А. Жданаў. У склад З. ф. уваходзілі арміі: 1-я (да крас. 1916), 2-я, 3-я, 4-я (да кастр. 1916), 10-я і Асобая (з снеж. 1916 да ліп. 1917). Паводле адпаведнага перапісу 20.4.1917 арміі фронту налічвалі 1 557 844 чал. і займалі каля 500 км пазіцый ад мяст. Відзы да р. Прыпяць. З-за слабай падрыхтаванасці Расіі да вайны, недастатковай узброенасці арміі, бладарнасці ваен. камандавання рус. войскі, нягледзячы на гераізм салдатаў, ужо ў першы год вайны атрымалі шмат паражэнняў. Цяжкае становішча склалася і на З. ф. Летам 1915 нім. войскі, каб акружыць рус. арміі ў Польшчы, пачалі адначасовае наступленне з Галіцыі і Усх. Прусіі. Рус. войскі 5 жн. пакінулі Варшаву, потым Асавец, Коўна, Брэст-Літоўск, 3 вер. Гродна. 9.9.1915 кав. групоўка ворага пачала наступленне ў кірунку Свянцяны — Варысаў і прарвала З. ф. на гатым участку (гл. *Свянцянскі прарыў 1915*). У пачатку восені 1915 немцы захапілі значную частку Літвы і Беларусі. У выніку 10-дзённых упартых баёў (вер.— кастр. 1915) вораг быў адкінуты да лініі азёраў Нарач — Свір. Фронт стабілізаваўся на доўгі час па лініі Дзвінск — воз. Нарач — Баранавічы — Пінск. У сак. 1916 войскі З. ф. над націскам саюзнікаў, каб аддзягнуць на сябе сілы праціўніка, пачалі наступленне ў раёне воз. Нарач, але поспеху не мелі. Страты забітымі, параненымі і палоннымі больш за 90 тыс. чал. 19.6—16.7.1916 на З. ф. была праведзена Баранавіцкая наступальная аперацыя (на Пін ад Баранавіч) сіламі 4-й арміі, каб садзейнічаць наступленню войск Паўд.-Зах. фронту.

Цяжкія паражэнні, бяссэнсавал пагібель сотні тысяч людзей, дрэннае харчаванне забеспячэнне ў тыле і на фронце, нястача боепрыпасаў выклікалі незадаволенасць, спрыялі росту рэвалюц. выступленняў салдатаў. Найб. значнае з іх было *Гомельскае размеркавальнае пункта паўстанне 1916*. З. ф. ахапіўся вялікай палітычнай і рабочай сілай, якой важнае значэнне аддавала бальшавіцкая партыя. Тут працавала многа парт. работнікаў, сярод якіх І. Я. Алібегаў, В. Г. Кнорын, М. І. Крыванэін, І. К. Ксенафонтаў, К. І. Ландар, І. Е. Любімаў, А. Ф. Мяснікоў, М. В. Фрунзе і інш. Рэвалюц. прапаганду сярод салдатаў вялі і парт. арг-цыі Беларусі. Пасля Лют. рэв. вялікі ўплыў на салдацкія масы З. ф. зрабіў загад № 1 Петраградскага Савета 1(14).3.1917, паводле якога ў часцях і злучэннях фронту былі створаны салдацкія к-ты. Яны фактычна былі органамі Саветаў і ажыццяўлялі палітычнае кіраўніцтва войскамі. Але Часовы ўрад са згоды меншавікоў і эсэраў, якія захапілі ўладу ў Саветах, прадаўжаў імперыял. палітыку царызму. Каб не дапусціць рэвалюцыянізацыі З. ф., тут пастаянна знаходзіліся чл. Дзярж. думы і ЦК партыі кадэтаў, сюды накіроўваліся Часовым урадам агітатары і дасылаліся бурж. газеты. Тут жа дзейнічалі такія бурж. арг-цыі, як К-т З. ф. Усерасійскага земсаюза, к-ты Саюза гарадоў і інш. Супраць агітатараў-бальшавікоў ваен. улады ўжывалі самыя жорсткія меры, аж да расстрэлу. З. ф. займаў важнае месца ў ленінскім плане ўзбр. паўстання. Рэвалюц. салдаты фронту павінны былі прымусіць сталіцы ад войск контррэвалюцыі і стаць на іх абарону. Бальшавізацыя фронту асабліва паскорылася пасля правалу ліпеньскага наступлення 1917, якое Часовы ўрад распачаў па патрабаванні сваіх саюзнікаў. Салдаты выходзілі з-пад уплыву эгадніцкіх партый, не падпарадкоўваліся загадам камандзіраў, патрабавалі спыніць сусв. бойню; яны актыўна удзельнічалі ў ліквідацыі *карнілаўшчыны*. Вялікае значэнне мела газ. «Звязда», якая пачала выходзіць у жн. 1917. На 5.10.1917 у часцях налічвалася 21 463 бальшавікі і 27 231 сачуваючы.

Парт. арг-цыі З. ф. ўначалілі салдацкія масы ў кастр. 1917 і садзейнічалі ўстанаўленню Сав. улады ў бел. і інш. губернях. 25.10.1917 Мінскі Савет уляў уладу ў свае рукі і 27.10(9.11).1917 стварыў *Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Заходняга фронту*, які змясціў галоўнакамандуючага З. ф. П. С. Балуева і прызначыў на яго месца бальшавіка В. В. Каменшчыкава. У ліст. прайшлі армейскія з'езды, якія перавыбралі к-ты армій і гл. Друг. *з'езд салдат 3-й арміі Заходняга фронту* 2—6(15—19).11.1917, *Другі з'езд салдат 2-й арміі Заходняга фронту* 1—3(14—16).11.1917, *Трэці з'езд салдат 10-й арміі Заходняга фронту* 7—11(20—26).11.1917, *Другі з'езд армій Заходняга фронту* 20—23.11 (3—8.12).1917 выбраў камандуючым фронту А. Ф. Мяснікова і франтавы к-т (100 чл., з іх 80 бальшавікоў). Перамога рэвалюцыі на З. ф. стварыла ўмовы хуткай ліквідацыі контррэвалюц. Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве. Салдаты З. ф. першыя пачалі ажыццяўляць ленінскі Дэкрэт аб міры і заключылі *дагавор аб перамір'і на Заходнім фронце*.

Перамога рэвалюцыі на З. ф.— вялікі поспех бальшавікоў, яна мела велізарнае значэнне ў далейшым развіцці сацыяліст. рэвалюцыі. У. І. Ленін пісаў: «Ні аб якім супраціўленні з боку арміі супроць Кастрычніцкай рэвалюцыі пралетарыята, супроць завявання палітычнай улады пралетарыятам, не магло быць і гутаркі, калі на Паўночным і Заходнім франтах у бальшавікоў была гіганцкая перавага, а на астатніх франтах, удаленых ад цэнтра, бальшавікі мелі час і магчымасць адпавядаць сялян у эсэраўскай партыі...» (Тв., т. 30, с. 238). З. ф. выдаліў са свайго складу рэвалюц. часці салдатаў для барацьбы з контррэвалюцыяй унутры краіны. Каля 15 тыс. салдатаў улілося ў Чырвоную Армію. Расфарміраваны 9 сак. 1918.

Кр.: Россия в мировой войне 1914—1918 годов (в цифрах), М., 1925; Разложение армии в 1917 году, М.— Л., 1925; Царская Россия в мировой войне, т. 1, Л., 1925; Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.), т. 3, Мн., 1933.

Літ.: Ленин В. И. О войне, армии и военной науке. Сборник, М., 1965; Гапоненко Л. Солдатские массы Западного фронта в борьбе за власть Советов (1917), М., 1953; Солодков Т. Е. Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907—1917), Мн., 1967; Кнорин В. Г. 1917 год в Белоруссии и на Западном фронте, Мн., 1923; В борьбе за Октябрь в Белоруссии и на Западном фронте. Воспоминания активных участников Октябрьской революции, Мн., 1957; Петров Н. Большевики на Западном фронте в 1917 году. Воспоминания, М., 1959; Самойло А. Две жизни, 2 изд., Л., 1963; Бонч-Бруевич М. Д. Вся власть Советам, М., 1964; Строков А. А. История военного искусства, М., 1967.

Ю. А. Каніч. Мінск.

ЗАХОДНІ ФРОНТ 1919—24. Створаны 12—19.2.1919 Галоўным камандаваннем усіх узбр. сіл РСФСР для абароны паўн.-зах. і зах. граніц Савецкай Рэспублікі. Штаб сфарміраваны з ліквідаванага штаба Паўн. фронту і знаходзіўся ў пач. 1919 у Старой Русе, потым у Смаленску.

Камандуючыя: М. М. Дамаскіраў (люты 1919), У. М. Гіпіс Да. М. Надзежны (люг.— ліп. 1919), У. М. Тухачэўскі (крас. ліп. 1919 — крас. 1920), М. М. Тухачэўскі (крас. 1920 — жн. 1921, студз. 1922 — сак. 1924), А. І. Пяроў (жн.— вер. 1921), А. І. Ягораў (вер. 1921 — студз. 1922), А. І. Корк (сак.— крас. 1924), А. І. Кук (крас. 1924). Чл. РВС: Р. Р. Рым (люг.— май 1919), А. Я. Сямашка (люг.— чэрв. 1919), А. І. Акулаў (май — чэрв. 1919), А. І. Лапін (сак.— ліп. 1919), А. І. Акулаў (ліп. 1919), А. І. Пазэрн (чэрв.— ліп. 1919), В. П. Сталін (студз. 1919 — студз. 1920), І. В. Сталін (ліп.— вер. 1919), Р. І. Берэін (ліп.— снеж. 1919), І. С. Уншліхт (крас. 1921), І. Т. Смілга (май — кастр. 1920), А. П. Розенгольц (май — чэрв. 1920), Ф. Э. Дзяржынскі (жн.— вер. 1920), Р. А. Муклевіч (вер. 1921 — крас. 1924), М. Ф. Новікаў (ліст. 1921 — крас. 1924), С. І. Гусеў (студз. 1922 — крас. 1924), І. М. Перапечка (ліп. 1922 — студз. 1923).

У склад Зах. фронту ўваходзілі: 7-я армія (камандуючыя: А. К. Ромеваў (студз.— ліп. 1919), М. С. Мацілевіч (ліп.— вер. 1919), С. Да. Харламаў (вер.— кастр. 1919), Да. М. Надзежны (кастр.— ліст. 1919), С. І. Адзінцоў (ліст. 1919 — ліп. 1920), М. М. Лашэвіч (жн. 1920), У. М. Зарубаеў (вер. 1920 — сак. 1921), М. М. Тухачэўскі (сак. 1921), Дз. М. Аўраў (сак.— май 1921); чл. РВС: У. С. Шатаў (люг.— кастр. 1919), І. І. Межлаук (май — чэрв. 1919), А. П. Розенгольц (ліп.— вер. 1919), М. М. Харытонаў (май — чэрв. 1919), Р. Я. Зіноўеў (ліп.— ліст. 1919), М. І. Падвойскі (кастр. 1919 — май 1921), І. В. Казлоўскі (кастр.— ліст. 1919), М. М. Лашэвіч (кастр. 1919 — жн. 1920), С. П. Мядзведзеў (снеж. 1919 — студз. 1920), Еўдакімаў (жн. 1920 — май 1921), Сямёнаў (жн. 1920 — май 1921), Дз. М. Аўраў (кастр. 1920 — сак. 1921)]; 15-я армія, да 31.5.1919 армія Сав. Латвіі (камандуючыя: І. І. Вацоціс (студз.— сак. 1919), П. А. Славен (сак.— чэрв. 1919), А. І. Корк (чэрв.— жн. 1919, вер. 1919 — кастр. 1920), С. Да. Харламаў (жн.— вер. 1919), В. Л. Пігродаў (кастр. 1920), С. А. Межаніноў (кастр.— снеж. 1920); чл. РВС: Я. Я. Тупін (люг.— сак. 1919), Я. Я. Печа (люг.— сак. 1919), А. Б. Дауман (люг.—чэрв. 1919); А. О. Сціга (люг.— сак. 1919), К. Х. Данішэўскі (сак.— чэрв. 1919), Р. А. Петэрсан (сак.— чэрв. 1919), Л. Д. Ленцман (крас. 1919 — люг. 1920), Ю. Ю. Межлаук (крас.— чэрв. 1919), М. І. Васільеў (чэрв.— вер. 1919), К. А. Механошын (чэрв. 1920), А. П. Розенгольц (чэрв.— вер. 1920), С. П. Нацаренус (ліп.— вер. 1920), М. С. Цікменеў (чэрв.— ліп. 1920), М. М. Лашэвіч (вер.— снеж. 1920), Я. І. Весніч (ліст.— снеж. 1920)]; 16-я армія, да 13.3.1919 Заходняя, да 9.6.1919 Беларуска-Літоўская [камандуючыя: А. Я. Снесарэў (ліст. 1918 — май 1919, чэрв.— ліп. 1919), П. К. Міронаў (май — чэрв. 1919), В. П. Глаголеў (ліп.— жн. 1919), М. В. Салагуб (жн. 1919 — вер. 1920), А. І. Кук (вер. 1920 — крас. 1921), Я. А. Шылоўскі (крас.— май 1921); чл. РВС: У. С. Селівачоў (снеж. 1918 — ліп. 1919), Ф. Ф. Норвід (сак.— чэрв. 1919), С. І. Вардоўскі (сак.— чэрв. 1919), І. С. Уншліхт (крас.— снеж. 1919), У. М. Смірноў (чэрв.— вер. 1919), А. М. Пыжоў (ліп. 1919 — чэрв. 1920), Р. А. Арджанікідзе (ліп.— вер. 1919), А. Б. Дауман (ліст. 1919 — чэрв. 1920), А. Г. Шлянтнікаў (ліст. 1919 — студз. 1920), М. А. Мулін (сак. 1920 — крас. 1921), Г. Л. Пятакоў (май — кастр. 1920), А. М. Арохаў (ліст.— снеж. 1920), А. Я. Эстрын (крас.— май 1921)]; Эстляндская армія ў люг.— маі 1919; 3-я армія з 11.6.1920 [камандуючыя У. С. Лазаравіч (чэрв.— кастр. 1920), М. Н. Какурын (кастр.— снеж. 1920), чл. РВС: К. А. Механошын (чэрв.— снеж. 1920), І. І. Межлаук (чэрв. 1920)]; 4-я армія з 11.6.1920 [камандуючыя: Я. М. Сарнеў (чэрв.— ліп. 1920), У. А. Мелікаў (ліп.— жн. 1920), А. Да. Шуваеў (жн.— кастр. 1920), чл. РВС: І. І. Межлаук (чэрв.— кастр. 1920), Н. І. Вегер (чэрв.— кастр. 1920), Юдалевіч (вер.— кастр. 1920)]; 3-і конны корпус (10-я і 15-я кав. дывізіі) з чэрв. 1920, у складзе 4-й арміі (камандуючы Г. Да. Гай); Мазырская група войск (57-я страліц. дывізія, 130-я страліц. брыгада і Дняпроўская ваен. флатылія) з 20.5.1920 (камандуючы Я. С. Хвесін); Заходняя армія з жн. 1919 займалася падрыхтоўкай рэзерваў і фарміраваннем запасных ваен. часцей, з 8.8.1920 знаходзілася ў рэзерве камандуючага З. ф.; 12-я армія у чэрв.— ліп. 1919 (камандуючы М. Р. Сямёнаў, чл. РВС: С. І. Аралаў, А. Я. Сямашка) і 14.8—26.9.1920 у аператыўным падпарадкаванні З. ф. (камандуючыя: Г. В. Васканаў, М. М. Кузьмін, чл. РВС: М. М. Кузьмін, У. В. Касіёр); 1-я конная армія 14.8—27.9.1920 у аператыўным падпарадкаванні З. ф. (камандуючы С. М. Будзённы, чл. РВС: К. Я. Варашылаў, С. К. Мінін).

У 1919 войскі З. ф. вялі пераважна абарончыя баі. 7-я армія абараняла ПнЗ краіны (у т. л. Петраград) супраць войск Фінляндыі, буржуазнай Эстоніі, рускага белагвардзейскага корпуса Радзянкі, арміі М. М. Юдзеніча і ваенна-марскіх сіл Антанты на Балтыйскім м. Армія Сав. Латвіі стрымлівала бурж.-нацыяналіст. атрады Літвы і Латвіі. Зах. армія дзейнічала на тэр. Літ.-Бел. ССР супраць войск бурж. Польшчы. Арміі налічвалі (люты 1919) 90 тыс. штыкоў і шабляў, 1941 кулямёт і 677 гармат супраць больш як 270 тыс. штыкоў і шабляў, 2400 кулямётаў і 750 гармат праціўніка. Звесткі пра дзеянні войск З. ф. ў 1920 гл. ў арт. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20, Савецка-польская вайна 1920.*

Пасля заключэння 12.10.1920 у Рызе дагавору аб перамір'і і папярэдніх умовах міру ваен. дзеянні на З. ф. спыніліся (18.10.1920). Войскі З. ф. прадаўжалі барацьбу з бандытызмам. 16 ліст. часці 16-й арміі перайшлі ў наступленне і за тыдзень разгромілі атрады Булак-Балаховіча. Адначасова войскі фронту вялі барацьбу з контррэвалюц. бандамі на тэр. Мінскай, Віцебскай, Гомельскай, Смаленскай і інш. губ. Акрамя 7-й арміі, 27-я страліц. дывізія 16-й арміі і некаторыя інш. часці прынялі ўдзел у разгроме кранштацкага мяцяжу (сак. 1921). У маі 1921 расфарміраваны 7-я і 16-я арміі. Для барацьбы з бандытызмам у ліп. 1921 створаны Рэвалюцыйны ваен. савет Мінскага р-на на чале з камандуючым войск на тэр. Беларусі І. П. Убарэвічам і 2 чл. РВС: наркомам ваен. спраў БССР Я. А. Адамовічам і старшынёй ЦК БССР Я. К. Ольскім. 8.4.1924 З. ф. быў ператвораны ў Зах. ваен. акругу (гл. *Беларуская ваенная акруга*).

Кр. і *літ.*: Гл. пры арт. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20.*

П. А. Селіванаў. Мінск.

ЗАХОДНІ ФРОНТ 1941—44 у Вялікую Айчынную вайну. Утвораны Указам Прэзідыума Вярх. Савета СССР 22.6.1941 з Зах. асобай ваен. акругі (гл. *Беларуская ваенная акруга*). Паводле дырэктывы Стаўкі Вярхоўнага камандавання ад 24.7.1941 З. ф. падзелены на Зах. і Цэнтральны франты, а 10.10.1941 у склад З. ф. перададзены арміі расфарміраванага Рэзервовага фронту. Рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 24.4.1944 З. ф. перайменаваны ў *Беларускі фронт трэці*, а яго левае крыло ўвайшло ў склад *Беларускага фронту другога*. Камандуючыя: ген. арміі Да. Р. Паўлаў, Маршал Сав. Саюза С. К. Цімашэнка, ген.-палк. І. С. Конеў, ген. арміі Г. К. Жукаў, ген.-л. В. Д. Сакалоўскі; чл. Ваен. Савета: корпусны камісар А. Я. Фаміных, ген.-л. М. А. Булганін; нач. штаба: ген.-м. У. Я. Клімаўскіх, ген.-м. Г. К. Маландзін, ген.-л. В. Д. Сакалоўскі, ген.-л. А. П. Пакроўскі.

У склад З. ф. у розны час уваходзілі арміі: 1-я ударная (ген.-л. В. І. Кузняцоў), 1-я паветраная (ген.-л. М. М. Громаў), 3-я (ген.-л. В. І. Кузняцоў, ген.-м. І. Р. Крэйзер), 4-я (ген.-м. А. А. Карабкоў), 4-я танкавая (ген.-л. В. М. Баданаў), 5-я (ген.-л. Да. Д. Лелюшэнка, ген.-л. Л. А. Говараў, ген.-л. В. С. Палена), 10-я (ген.-м. К. Да. Голубеў, ген.-л. П. І. Галікаў, ген.-л. В. С. Папоў), 16-я гвардзейская (ген.-л. А. В. Сухамлін), 11-я (ген.-л. І. І. Фядзюнінскі), 11-я гвар-

дзейская (ген.-л. І. Х. Баграмян), 13-я (ген.-л. П. М. Філатаў, ген.-м. А. М. Гарадзянскі, ген.-л. В. П. Герасіменка), 16-я (ген.-л. К. К. Ракасоўскі), 19-я (ген.-л. І. С. Конеў, ген.-л. М. Ф. Лукін, ген.-л. І. В. Болдзін, ген.-л. П. А. Ершакоў), 20-я (ген.-л. Ф. М. Рамізаў, ген.-л. В. П. Герасіменка, ген.-л. П. А. Курачкін, ген.-л. М. Ф. Лукін, ген.-л. П. А. Ершакоў), 21-я (ген.-л. В. П. Герасіменка, ген.-палк. Ф. І. Кузняцоў, ген.-л. М. І. Крылоў), 22-я (ген.-л. П. А. Ершакоў, ген.-л. В. А. Юшкевіч), 24-я (ген.-м. К. І. Ракуцін), 30-я (ген.-л. У. Я. Калпакчы, ген.-м. Дз. Д. Лелюшэнка), 31-я (ген.-м. У. А. Глуздоўскі, ген.-м. В. М. Далматаў), 32-я (ген.-м. С. У. Вішнеўскі), 33-я (камбрыг Дз. П. Анупрыенка, ген.-л. М. Р. Яфрэмаў, ген.-палк. В. М. Гардоў), 43-я (ген.-м. П. П. Сабеннікаў, ген.-л. С. Дз. Акімаў, ген.-м. К. Дз. Голубеў), 49-я (ген.-л. І. Р. Захаркін, ген.-л. І. Ц. Грышын), 50-я (ген.-м. А. П. Ермакоў, ген.-л. І. В. Болдзін), 68-я (ген.-л. Я. П. Жураўлёў), 4-ы паветр. дэсантны корпус (ген.-л. А. С. Жадаў), Пінская ваен. флатылія (контр-адмірал Дз. Дз. Рагачоў).

У першыя тыдні Айч. вайны захопнікі наткнуліся на ўпартае супраціўленне войск фронту ў баях за Мінск, Магілёў, Гродна, Слонім, на Бярэзіне і Дняпры. Неўміручы подзвіг здзейснілі абаронцы Брэсцкай крэпасці (гл. *Брэсцкай крэпасці абарона 1941*). У ходзе гэтых баёў гітлераўцам былі прычынены цяжкія страты і сарваны іх планы маланкавага наступлення на Зах. напрамку. Арміі фронту ўдзельнічалі ў разгроме ням.-фаш. захопнікаў пад Масквой. У снеж. 1941—студз. 1942 імі вызвалены гарады: Сонечнагорск, Сталінагорск, Клін, Істра, Алексін, Таруса, Валакаламск, Нара-Фамінск, Казельск, Калуга, Бялёў, Малаяраславец, Бараўск, Можайск, Сухінічы. 2—22.3.1943 разам з войскамі Калінінскага фронту ліквідавалі ржаўска-вяземскі плацдарм гітлераўцаў, з якога яны збіраліся зноў пачаць наступленне на Маскву. 12.7.1943 разам з Браснскім фронтам перайшлі ў контрнаступленне супраць арлоўскай групоўкі ворага, у гэты дзень у раёне Прохараўкі адбылася найвялікшая ў гісторыі Айч. вайны танкавая бітва, у якой з абодвух бакоў удзельнічала да 1,5 тыс. танкаў і самаходных гармат. У выніку гэтага контрнаступлення 5.8.1943 вызвалены Арол. У жн.— вер. 1943 войскі З. ф. ўдзельнічалі ў наступленні на цэнтр. участку сав.-германскага фронту і 25.9.1943 вызвалілі Смаленск.

Літ.: История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941—45, т. 2—4, М., 1961—62.

М. І. Літвінковіч. Мінск.

ЗАХОДНІ ШТАБ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ (ЗШПР), аператыўны орган пры Ваенным Савеце Зах. фронту для кіраўніцтва партыз. рухам і арганізацыі ўзаемадзеяння партызанаў з войскамі ў палосе фронту ў Вял. Айч. вайну. Створаны 30.5.1942 паводле пастановы Дзяржаўнага Камітэта Абароны, існаваў да снеж. 1943. 5.10.1942 перайменаваны ў прадстаўніцтва ЦШПР на Зах. фронце, 2.7.1943 — у Смаленскі штаб партыз. руху, 4.1.1944 — у аператыўную групу БШПР на 3-м Бел. фронце. Нач. штаба паслядоўна былі С. С. Бельчанка, Дз. М. Папоў, А. А. Прохараў.

ЗАХОДНІКІ, прадстаўнікі адной з плыняў рускай грамадскай думкі 40—50-х г. 19 ст., што выступалі за ліквідацыю прыгонніцтва і ў адрозненне ад *славянафілаў* за развіццё Расіі зах.-еўрапейскім, г. зн. капіталіст. шляхам.

Тэрмін З. ўмоўны і не строга навуковы. Да З. належалі літаратары, вучоныя П. Я. Чаадаеў, І. С. Тургенеў, В. П. Боткін, П. В. Анненкаў, Ц. М. Граноўскі, К. Дз. Кавелін, П. М. Кудрацаў, С. М. Салаўёў, Б. М. Чычэрын, М. Н. Катков, А. В. Нікіценка, І. К. Бабст, І. В. Вярнадскі і інш. Да З. далучаліся пісьменнікі і публіцысты Дз. В. Грыгаровіч, І. А. Ганчароў, А. В. Дружынін, А. П. Заблоцкі-Дзесятоўскі, В. М. Майкаў, У. А. Мілюцін, М. А. Някрасаў, І. І. Панаеў, А. Ф. Пісемскі, М. Я. Салтыкоў-Шчадрын. У барацьбе супраць рэакц. «тэорыі афіцыйнай народнасці» і ў ідэйных спрэчках з славянафіламі у 40-я г. разам з З. выступалі прадстаўнікі рэвалюц.-дэмакр. ідэалогіі А. І. Герцэн, М. П. Агароў, В. Р. Бялінскі. З. даказвалі перавагу наёмнай працы перад прыгоннай, складалі праекты адмены прыгоннага права шляхам урадавай рэформы, паводле якой сяляне павінны былі заплаціць памешчыкам выкуп за невялікі зямельны надзел і за вызваленне. Паліцэйска-бюракратычны рэжым Мікалая I, рэакц. палітыка, цэнзура, нац. і саслоўны прыгнёт выклікалі рэзкую крытыку з боку З. Грамадская і навук.-літ. дзейнасць З. была абмежавана накіравана на тое, каб наблізіць капіталіст. і спрыяць яго развіццю, устанавіць у Расіі буржуазна-парламенцкі лад. З. супрацоўнічалі ў час. «Отечественные записки» (з 1839), «Современник», «Русский вестник» (з 1856), «Атеней» (1858—59), газ. «Московские ведомости», «Санкт-Петербургские ведомости», у літ. зборніках «Физиология Петербурга» (1845), «Петербургский сборник» (1846). У 2-й пал. 40-х г. у асяроддзі З. пачаліся розныя погляды, якія ў 50-я — пач. 60-х г. прывялі да канчатковага размежавання рэвалюц.-дэмакр. і ліберальнага кірунку. З.-ліберальны адстойвалі буржуазна-памешчыцкі лібералізм, баяліся нар. рэвалюцыі, прагрэс. развіццё краіны бачылі ў рэформах, асноце і культурніцтве; хацелі ўстанаўлення буржуазна-канстытуц. манархіі; у філасофіі былі ідэалістамі і прыхільнікамі рэлігіі. У гады рэвалюц. сітуацыі ў Расіі (1859—61) З.-ліберальны і славянафілы аб'ядналіся на аснове агульных праектаў адмены прыгону «зверху» і разам выступалі супраць рэвалюц.-дэмакратаў. Ва ўмовах капіталіст. развіцця ў пасляреформенны перыяд заходніцтва як кірунак грамадскай думкі знікла.

Літ.: Ленін У. І. Эканамічны змест народніцтва і крытыка яго ў кнізе п. Струве (Аддлюстраванне марксізма ў буржуазнай літаратуры), Тв., т. 1 (Полн. собр. соч., т. 1); яго ж. Яшчэ да пытання аб тэорыі рэалізацыі, Тв., т. 4 (там жа, т. 4); яго ж. Ганіцелі земства і анібалы ліберальнай думы, Собр. соч., т. 9, М., 1956; Герцен А. И. Былое и думы, Собр. соч., т. 9, М., 1956; Галактионов А. А. и Никандров П. Ф. Русская философия XI—XIX веков, Л., 1970.

В. І. Сцяпаноў. Мінск.

«ЗАХО́ДНІЯ», спец. партыз. група НКДБ БССР, якая ў Айч. вайну змагалася супраць ням.-фаш. акупантаў на Беларусі. 13.10.1943 група (7 чал.) перакідзена ў варожы тыл. камандзір Ф. С. Пілюгін (псеўданім «Артур»). Дзейнічала на тэр. Жалудоцкага р-на Баранавіцкай вобл., Ваўкавыскага і Аўгустоўскага р-наў Беластоцкай вобл. Партызаны групы «З.» пусцілі пад адхон 12 варожых эшалонаў, знішчылі 2 танкі, 10 аўтамашын, 2 масты, шлюз на Аўгустоўскім канале, 2 станцыю, здабывалі і перадавалі камандаванню Чырв. Арміі звесткі пра буд-ва гітлераўцамі аэрадромаў, дыслакацыю ваен.-прамысл. аб'ектаў, гарнізонаў, ваен. складаў, перамяшчэнне войск. 13.7.1944 група (51 чал.) злучылася з Чырв. Арміяй.

Літ.: В едином строю. Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии. 1941—1944, Мн., 1970, с. 484.

І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак. Мінск

ЗАХОДНЯЯ АПЕРАТЫЎНАЯ ГРУПА ЦК КП(б)Б, аператыўны орган па наладжванні сувязі ЦК КП(б)Б з падпольнымі арганізацыямі і партыз. фарміраваннямі на ПдУ і Пд Беларусі. Створана ў сак. 1942 паводле рашэння ЦК КП(б)Б. Дыслацыравалася ў палосе Бранскага фронту. Узначальваў сакратар ЦК КП(б)Б І. І. Рыжыкаў. Расфарміравана 2.6.1942, часткова яе функцыі выконвала *Паўночна-Заходняя аператыўная група ЦК КП(б)Б.*

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ, частка тэр. БССР, захопленая ў 1920 бурж. Польшчай і паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* знаходзілася ў яе складзе да вер. 1939.

Тэр. З. Б. каля 82 тыс. км² (21% тэр. Польшчы). Паводле адм.-тэр. падзелу Польшчы З. Б. уваходзіла ў склад 4 ваяводстваў: Навагрудская (Баранавіцкі, Валожынскі, Лідскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Слонімскі, Стаўбцоўскі, Шчучынскі пав.), Палеская (Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі пав.), Віленская (Ашмянскі, Браслаўскі, Вілейскі, Дзісенскі, Маладзечанскі, Пастаўскі, часткова Свянцянскі і Віленска-Троцкі пав.), Беластоцкая (Ваўкавыскі і Гродзенскі, часткова Аўгустоўскі і Сакольскі пав.). Найбольшыя гарады: Гродна, Брэст, Слонім, Ліда, Навагрудак, Пінск, Лунінец, Кобрын, Пружаны, Ваўкавыск, Баранавічы, Маладзечна, Вілейка. Паводле перапісу 1921 насельніцтва З. Б.— 3372 тыс. чал. (каля 13% нас. Польшчы), паводле ацэнкі 1939 — больш за 4 млн. чал.

Польскія ўлады не прызнавалі тэрміна З. Б. і ў афіц. дакументах называлі З. Б. (з Валынскім ваяводствам) «крэсы всходне» («усходнія ўскраіны»). У З. Б. была адноўлена ўлада буржуазіі і памешчыкаў, устаноўлены суровы акупацыйны рэжым; вялася палітыка бязлітаснай эксплуатацыі і нац. прыгнёту працоўных, рабавання прыродных багаццяў краю. У эканам. адносінах З. Б. была адсталай ускраінай, агр. прыдаткам цэнтр. раёнаў Польшчы, крыніцай сыравіны і танfar рабочай сілы, рынкам збыту для польскай прамысловасці. Больш за 80% насельніцтва З. Б. займалася с. гасп. 3402 буйным памешчыкам (зямельныя надзелы звыш 100 *га*), якія складалі менш 1% землеўладальнікаў, належала больш чым палавіна ўсёй прыватнаўласніцкай зямлі (гл. табл.). Асобныя магнаты (Радзівіл, Патоцкі, Сапега, Тышкевіч і інш.) мелі дзесяткі тысяч *га* зямлі. У сярэднім на памешчыцкі маёнтак



Ручная праца на гарбарным заводзе ў Гродне. Заходняя Беларусь.

Размеркаванне зямлі паміж рознымі катэгорыямі гаспадарак Заходняй Беларусі (паводле перапісу 1921)

Класіфікацыя гаспадарак па плошчы зямлі, якая ім належала, *га*	Колькасць гаспадарак	%	Плошча зямлі, якая ім належала, *га*	%	Сярэдні надзел, *га*
Бядняцкія					
Менш за 2	48 197	13,57	50 745	0,95	1,05
2—5	123 086	34,65	433 154	8,11	3,52
5—10	113 423	31,93	806 216	15,09	7,11
Усяго	284 706	80,15	1 290 115	24,15	4,53
Серадняцкія					
10—20	49 426	13,91	667 577	12,50	13,51
Кулацкія					
20—50	15 107	4,25	434 696	8,14	28,77
Памешчыцкія					
50—100	2585	0,73	175 636	3,29	68,00
Больш за 100	3402	0,96	2 772 669	51,92	815,00
Усяго	5987	1,69	2 948 305	55,21	500,00
Усяго разам	355 226	100	5 340 693	100	

Хата селяніна в. Стаховічы Палескага ваяводства.



прыпадала 500 *га*, а на сялянскі двор менш за 7 *га* зямлі. Сяляне пакутавалі ад беззямелля і малазямелля, перажыткаў прыгонніцтва (адработкі, *шарваркі*), ад цяжкіх падаткаў, высокіх цэн на прамысл. тавары шырокага ўжытку (запалкі, газа, тытунь, соль), запазычанасці ў банках. Улады насаджалі ў З. Б. польскіх каланістаў — *асаднікаў*, ажыццяўлялі палітыку хутарызацыі — да 1939 на хутары расселена каля 70% сялянскіх гаспадарак. Бязлітасна эксплуатаваліся парабкі (каля 70 тыс. чал.). Перанаселеная вёска не мела адтоку ў прамысловасць, гэта вымушала сялян у пошуках работы і сродкаў да існавання масава эміграваць у



Першамайская дэманстрацыя працоўных Гродна. 1937.

краіны Зах. Еўропы і Амерыкі. Разбураная войнамі прамысловасць не аднаўлялася, новыя прамысл. прадпрыемствы не будаваліся, прыродныя багацці распрадаваліся замежным капіталістам. Многія галіны прамысловасці так і не дасягнулі ўзроўню 1913 ці зусім ліквідаваны, асабліва ў гады эканам. крызісу 1929—33. Удзельная вага прамысловасці З. Б. ва ўсёй прамысл. вытворчасці Польшчы складала 3%. Колькасць рабочых у прамысловасці і на транспарце ледзь перавышала 40 тыс. чал. (менш за 5% рабочых Польшчы). Панавала хранічнае беспрацоўе. У 1936 у З. Б. было больш за 25 тыс. беспрацоўных. Рабочы дзень на прадпрыемствах дасягаў 10—12 і болей гадзін, заработная плата была ніжэйшая, чым у карэннай Польшчы. У адносінах да беларусаў і інш. нац. меншасцяў польскі ўрад вёў вялікадзяржаўна-шавіністычную палітыку: не прызнаваў іх за нацыю, вёў прымусовую паланізацыю, забараняў школы на роднай мове, абмяжоўваў прыём у ВНУ і на работу ў дзярж. ўстановы, не дазваляў карыстацца роднай мовай у дзярж. установах. З 500 бел. школ, якія існавалі на тэр. З. Б. напярэдадні польск. інтэрвенцыі, да 1936 асталося 16, а да 1939 бел. школ не было зусім. Былі закрыты таксама 5 бел. гімназій, 2 настаўніцкія семінарыі. Прагрэсіўныя бел. газеты штрафаваліся, канфіскаваліся і забараняліся; закрываліся бел. бібліятэкі, клубы, выдавецтвы. Гал. метадам панавання і кіравання польскага бурж.-памешчыцкага ўрада ў З. Б. быў масавы тэрор. Паліт. вязнямі былі перапоўнены турмы і *Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер*, у якім бываліся шматлікія судовыя паліт. працэсы. Буйныя працэс 94-х (1926), працэсы 56-ці, 130-ці (1928), працэсы 35-ці, 75-ці (1929) і інш. (сярод кожны працэс гл. адпаведны арт.). Актыўнымі намагатымі польскіх улад былі беларускія нацыяналісты. Іх паліт. партыі і арг-цыі — *Беларуская хрысціянская дэмакратыя* (БХД), *Беларускі сялянскі саюз* (БСС), «Шчырацтрасаюз», т. зв. беларуская санацыя, і інш. — за дробныя ўступкі на карысць бел. буржуазіі і кулакоў прадавалі карэнныя інтарэсы народа. Працоўныя З. Б. вялі настойлівую барацьбу за сац. і нац. вызваленне, за ўз'яднанне з БССР [гл. *Партызанскі рух у Заходняй Беларусі 1921—25, Косаўскі расстрэл 1927, Асташынскае выступленне сялян* (1932), *Кобрынскае ўзброенае выступленне сялян 1933, Нарачанскіх рыбакоў выступленне 1935*]. Рэвалюц. рух працоўных з 1923 узначальвала *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі* (КПЗБ). Пад яе кіраўніцтвам дзейнічалі *Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі* (КСМЗБ) і *Чырвоная дапамога* (МОПР Зах. Беларусі), а таксама рэвалюцыйна-дэмакр. нац.-вызв. арг-цыі: *Беларуская сялянска-рабочая грамада* (БСРГ), *Змаганне*, культ.-асветная арг-цыя *Таварыства беларускай школы* (ТБШ) і інш. 17.9.1939, пасля нападу на Польшчу фаш. Германіі, Чырв. Армія па распараджэнні Урада СССР узяла пад абарону насельніцтва З. Б. Працоўныя З. Б. з радасцю сустракалі Чырв. Армію-вызваліцельніцу і актыўна памагалі ёй: уздымалі ўзбр. выступленні, стваралі органы Рабочай гвардыі, Часовыя ўпраўленні, падаўлялі супраціўленне пануючых эксплуататарскіх класаў, устанаўлівалі рэвалюц. парадак. *Народны сход Заходняй Беларусі*, які адбыўся ў Беластоку 28—30.10.1939, прыняў Дэкларацыю пра абвяшчэнне Сав. уладай, уключэнне З. Б. ў склад СССР і ўз'яднанне яе з БССР. 2.11.1939 сесія Вярх. Савета СССР і 12.11.1939 сесія Вярх. Савета БССР адзінадушна прынялі законы аб уключэнні З. Б. ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР (гл. *Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР*, а таксама асобны том *Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*.

Чырвонаармейцы раздаюць насельніцтву Зах. Беларусі савецкія газеты. Верасень 1939.



Літ.: История Белорусской ССР, т. 2, Мн., 1961, с. 347—375; Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966; Лочмель П. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов, М., 1940; Горбунов Т. С. Воссоединение белорусского народа в едином Советском социалистическом государстве, М., 1948; У суровые годы подполья (Успаміны былых членаў КПЗБ — актыўных удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі), Мн., 1958; Арэхва М. С. Рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі ў гады белапольскай акупацыі, Мн., 1958; Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы, т. 1 (1921—1929 гг.), Мн., 1962; Народное (национальное) собрание Западной Белоруссии. 28—30 октября 1939 г. Стенографический отчет, Мн., 1946; Мацко А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933—1939 гг.), Мн., 1963; Полуян В. и Полуян И. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920—1939 гг., Мн., 1962; Ихжа. Революционное движение в Западной Белоруссии в 1930—1939 гг., у кн.: Из истории польского рабочего движения, М., 1962; Палуян У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада, Мн., 1967; Сорокин А. А. Освободительное и революционное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920—1939 гг.), Мн., 1970; Ягож. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920—1939 гг.), Мн., 1968.

І. П. Хайратовіч. Мінск.

ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЦЬ, адм.-тэр. адзінка ў Савецкай Расіі ў 1917—19. У маі 1917 на з'ездзе Саветаў Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губ. было створана абл. аб'яднанне Саветаў пад назвай З. в. з цэнтрам у Мінску. Пасля перамогі Кастр. рэвалюцыі яно стала адм.-тэр. адзінкай, у якую ўвайшлі Віленская, Віцебская, Магілёўская і Мінская губ. Пасля захопу часткі Беларусі нямецкімі акупантамі (люты 1918) цэнтр вобласці перанесены ў Смаленск і ў яе склад, акрамя неакупаваных паветаў Віцебскай і Магілёўскай губ., паводле пастановы II з'езду Саветаў Заходняй вобл. (10—14.4.1918) увайшла Смаленская губ. На 3-м абл. з'ездзе Саветаў (11—13.9.1918) З. в. перайменавана ў Заходнюю камуну. Скасавана ў сувязі з абвяшчэннем Беларускай ССР.

Літ.: Круталевич В. А. Административно-территориальное устройство БССР, Мн., 1966.

Я. Ф. Шорахай. Мінск.


ЗАХО́ДНЯЯ ДЗВІНА (у Латв. ССР — Даўгава), рака ў Еўраз. частцы СССР. Даўж. 1020 *км*. Пл. бас. 87 900 *км*². Пачынаецца на Валдайскім узв. з воз. Каракіна на выш. 221 *м* над узр. м., за 14 *км* ад вытока Волгі. Упадае ў Рыжскі заліў Балтыйскага м.

Верхняе цячэнне (335 *км*, пл. бас. 18,3 тыс. *км*²) па тэр. РСФСР (Калінінская, часткова Пскоўская і Смаленская вобл.). Сярэдняе цячэнне (328 *км*, пл. бас. 45 тыс. *км*²) пераважна на тэр. Віцебскай вобл. БССР. Паверхня вадазбору тут раўнінная (Полацкая нізіна), з Пн і Пд заходзяць адгор'і Гарадоцкага ўзв., Браслаўскай грады, Віцебскага і Аршанскага ўзв., Свяцянскіх градаў. Лясістасць вадазбору 22%, забалочанасць 18, азёрнасць 3%. Найб. азёры: Асвейскае, Нешчарда, Езярышча, Лукомскае. Даліна ракі ад граніцы з РСФСР да вусця р. Друйкі трапецападобнай формы, шыр. 1—1,5 *км*, найб. 2,5 *км*. Схілы пераважна высокія, 10—15 *м*, да вусця р. Шэвінкі, ніжай г. п. Ула, стромкія, выш. да 40 *м*. Шыр. поймы 300—500 *м*, найб. 2,5—3 *км*. Затапляецца толькі ў высокае разводдзе (1931, 1956). Рэчышча звілістае, шмат пераката і астравоў. Вышэй Віцебска на працягу 12 *км* каля Рубы, Вярхоўя і Капачоў у рэчышчы выходзяць на паверхню дэвонскія даламіты і ўтвараюць парогі. У сутоку Дзісны і З. Дз. скопішчы валуноў ледавіковага паходжання. Шыр. рэчышча 100—150 *м*, каля г. п. Друі да 0,7 *км*. У разводдзе ўзровень вады ў рацэ вышэй межаннага ў Віцебску на 775 *см* (найб. 1255 *см* у 1931), у Полацку на 732 *см* (найб. 1104 *см* у 1956). Ледастаў з 1-й дэкады снеж. да 1-й дэкады красавіка. Найб. таўшчыня лёду 48—54 *см*. Веснавы ледаход 5—9 дзён. Сярэдні гадавы расход вады каля Віцебска 226 *м*³/*сек*, каля Полацка 307 *м*³/*сек*, на граніцы з Латв. ССР 468 *м*³/*сек*. Большая ч. гадавога сцёку па З. Дз. праходзіць у перыяд веснавога разводдзя — 57% (сак.— май), летам і ўвосень — каля 30 (чэрв.—ліст.), у зімовую межань 13% (снеж.— люты). Сярэдняя месячная т-ра вады каля Полацка 13 (май), 18,9 (чэрв.), 20,8 (ліп.), 19,2 (жн.), 13,2 °С (вер.). Сцёк завіслых часцінак па З. Дз. на граніцы з Латв. ССР 500—790 тыс. *т* у год. Ніжняе цячэнне З. Дз. (357 *км*, пл. бас. 24,6 тыс. *км*²) на тэр. Латв. ССР; найбольшая рака Латвіі. Шыр. каля Рыгі 700 *м*, глыб. 8—9 *м*, у разводдзе вада падымаецца да 450 *см*. Сярэдні гадавы расход вады каля вусця 666 *м*³/*сек*. Найбольшыя прытокі: Мёжа, Каспля, Лучоса, Ула, Ушача, Дзісна (злева); Обаль, Дрыса, Айвіекстэ (справа). Засяленне бас. З. Дз. пачалося ў эпоху мезаліту (вядомы паселішчы каля в. Жарцы, Красамай, *Крумплева, Крыжы*, Якубінкі Віцебскай вобл.). У эпоху неаліту гэтая тэр. з'яўлялася паграніччам розных неалітычных культур. У бронзавым веку тут жылі фіна-угры і балты, у жалезным веку — плямёны *днепра-дзвінскай культуры*. У 2-й пал. 1-га тысячагоддзя верхняе і сярэдняе цячэнне ракі пачалі каланізаваць славяне, тут сфарміраваліся полацкія крывічы, у ніжнім цячэнні жылі латгалы, селы, земгалы, лівы. З 9 ст. частка бас. ракі ўваходзіла ў Полацкае, пазней Смаленскае княствы; полацкія князі пашыралі ўплыў на тэрыторыі па ніжнім цячэнні, заснавалі крэпасці *Герцыке* і *Кукенойс*, якія адыгралі вял. ролю ў барацьбе з ням. агрэсіяй. У 2-й пал. 12 — пач. 13 ст. ў ніжнім цячэнні З. Дз. з'явіліся крыжакі, яны заснавалі там некалькі крэпасцей, у т. л. Рыгу. З стараж. часоў З. Дз.— важны гандлёвы шлях, у 9—11 ст. тут праходзіў адзін з напрамкаў шляху з «варагаў у грэкі». У 13 ст. па З. Дз. Полацк, Віцебск, Смаленск гандлявалі з Рыгай. З 14 ст. басейн З. Дз. ў складзе Вял. кн. Літоўскага. У 16—17 ст. Іван IV Грозны і Аляксей Міхайлавіч беспаспяхова спрабавалі замацавацца на З. Дз. У 1710 Пётр I авалодаў Рыгай і ніжнім цячэннем ракі. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) верхняе і сярэдняе цячэнне З. Дз. ў складзе Рас. імперыі. У сав.-польскую вайну 1920 на З. Дз. дзейнічала *Заходнедзвінская ваенная флатылія*. Суднаходства па З. Дз. ад р. Тароны да г. Ліваны і ад г. Яўнелгава да вусця. На тэр. Латв. ССР пабудавана Кегумская ГЭС (72 тыс. *кВт*, пл. вадасх. 24 *км*², аб'ём 150 млн. *м*³); Плявіньская ГЭС (825 тыс. *кВт*, пл. вадасх. 45 *км*², аб'ём 630 млн. *м*³), будуецца (1971) Рыжская ГЭС (384 тыс. *кВт*). Створаны праекты пабудовы ГЭС на тэр. Латв. ССР (каля Даўгаўпілса, Екабпілса), на тэр. БССР (каля Віцебска і Полацка). Найб. гарады на З. Дз.: Веліж, Віцебск, Полацк, Наваполацк, Верхнядзвінск, Даўгаўпілс, Рыга. Сярэднегадавыя патэнцыяльныя гідраэнергарэсурсы З. Дз. на тэр. БССР каля 150 тыс. *кВт*.

Літ.: Россия. Полное географическое описание нашего отечества, под ред. В. П. Семенова, т. 9, СПб., 1905; Сапунов А. (сост.). Река Западная Двина. Историко-географический обзор, Витебск, 1893.

Г. В. Штыхаў (гістар. даведка). Мінск.

Заходняя Дзвіна каля вёскі Камары ў Віцебскім раёне.



ЗАХОДНЯЯ КАМУ́НА, адм.-тэр. адзінка ў Сав. Расіі ў 1918, гл. *Заходняя вобласць*.

ЗАХО́ДНЯЯ САХА́РА, гл. *Сахара Заходняя*.

ЗАХО́ДНЯЯ УКРАІ́НА, гістар. назва зямель, што ўваходзяць у сучасныя Львоўскую, Івана-Франкоўскую, Цярнопальскую, Валынскую і Ровенскую вобласці.

У выніку распаду Аўстра-Венгерскай імперыі ў ліст. 1918 на тэр. З. У. (Усх. Галіччыны) укр. бурж. нацыяналісты стварылі Заходнеўкраінскую нар. рэспубліку (ЗУНР). У ліп. 1919 тэр. З. У. акупавана польскімі войскамі і паводле *Рыжскага мірнага дагавору 1921* уключана ў склад бурж. Польшчы. Працоўныя З. У. пад кіраўніцтвам *Камуністычнай партыі Заходняй Украіны* (КПЗУ) амаль 20 гадоў вялі актыўную барацьбу супраць сац. і нац. прыгнёту. У вер. 1939 Чырв. Армія вызваліла З. У. і *Заходнюю Беларусь*. 26—28.10.1939 у Львове Народны сход З. У. прыняў рашэнне пра ўстанаўленне Сав. улады і ўваходжанне З. У. ў склад УССР і дэкларацыю пра канфіскацыю памешчыцкіх і манастырскіх зямляў, нацыяналізацыю банкаў і буйной прамысловасці. 1.11.1939 сесія Вярх. Савета СССР прыняла закон аб уваходжанні З. У. ў склад СССР; 14.11.1939 сесія Вярх. Савета УССР прыняла закон аб уваходжанні З. У. ў склад УССР. Гл. таксама *Українская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка* (раздзел «Гісторыя»), *Галіччына*, *Валынская зямля*. *І. П. Хайратовіч*. Мінск.

ЗАХОДЫ, вёска ў Раснянскім с/с Горацкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 47 *км* на ПдУ ад Горак, 70 *км* ад Магілёва, 15 *км* ад чыг. ст. Цёмны Лес. 86 ж., двароў 34 (1971). Б-ка. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАХОДЫ, вёска ў Дуброўскім с/с Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. Цэнтр калгаса «Шлях Леніна». За 37 *км* на З ад Рэчыцы, 82 *км* ад Гомеля, 21 *км* ад чыг. ст. Бабічы, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з шашой Светлагорск — Рэчыца. 502 ж., двароў 144 (1971). Філіял раённага камбіната быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. і вет. пункты, аддз. сувязі, магазін. У чэрв. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 23 мірных жыхароў.

ЗАХОДЫ, вёска ў Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл., па р. Арціслаўка. Цэнтр сельсавета. За 32 *км* на ПдУ ад Шклова, 30 *км* ад Магілёва, 27 *км* ад чыг. ст. Магілёў (па шашы), на скрыжаванні аўтамагістралі Ленінград — Адэса і аўтамаб. дарогі, якая звязвае З. з в. Дрыбін. 194 ж., гасп. 76 (1971). Лясніцтва Магілёўскага лясгаса. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны.


ЗАЦІРКА, традыцыйная беларуская страва. З пшанічнай, ячменнай ці грэцкай мукі тонкага памолу робяць крутое цеста на вадзе, дадаюць яйкі, масла, соль, часам цукар, перамешваюць. Камячкі цеста засыпаюць у гарачае малако. З., згатаваную на вадзе, заліваюць сырым ці пераным малаком або заскварваюць салам з цыбуляю.

ЗАЦІТАВА СЛАБАДА, вёска ў Пухавіцкім с/с Пухавіцкага р-па Мінскай вобл., пры ўпадзенні р. Цітаўкі ў р. Свіслач. Цэнтр калгаса імя Чапаева. За 11 *км* на У ад Мар'інай Горкі — адм. цэнтра раёна, 74 *км* ад Мінска, 11 *км* ад чыг. ст. Пухавічы, каля шашы Мінск — Бабруйск (2 *км*). 511 ж., гасп. 170 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, магазін. Помнік на брацкай магіле сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАЦКАВА, возера ў бас. р. Пырапкі, правага прытока Котры, у Гродзенскім р-не. Пл. 0,75 км². Даўж. 2,2 *км*, найб. шыр. 0,5 *км*, сярэдняя 0,3 *км*, найб. глыб. 7 *м*. Катлавіна выцягнулася з Пн на Пд. Вадазбор спадзістахвалісты, складзены з марэны. З. праточны, праз яго працякае р. Сламянка, якая ўпадае ў воз. Белае. Водзяцца плотка, акунь, лешч, шчупак, язь, дыгір.


ЗАЦЬМЕ́ННІ, астранамічныя з'явы, пры якіх тое ці іншае нябеснае свяціла часткова або поўнасцю робіцца нябачным з-за таго, што больш далёкае ад Зямлі нябеснае цела закрываецца больш блізкім, ці таму, што на адно нябеснае цела падае цень другога.

Сонечныя З. адбываюцца, калі Месяц (у фазе маладзіка), праходзячы паміж Зямлёю і Сонцам, поўнасцю ці часткова засланяе Сонца зямному назіральніку (рыс. 1). Поўнае З. Сонца назіраецца



Рыс. 1. Схема сонечнага зацьмення: *1* — конус поўнага зацьмення; *2* — зона часткоўага зацьмення; *а* — поўнае зацьменне; *б* — часткоўае зацьменне; *в* — кольцападобнае зацьменне.

толькі там, дзе на Зямлю падае цень Месяца. Дыяметр цяню звычайна не перавышае 250—270 км. Месяц рухаецца, і яго цень перамяшчаецца, пазначаючы паслядоўна вузкую палосу поўнага З. Фаза поўнага З. цягнецца не больш як 7 хв 30 *сек*, найчасцей 2—3 *мін*. Па-за палосай, куды падае паўцень Месяца, назіраецца часткоўае З. Сонца. Калі бачны вуглавы дыяметр Месяца менш за сонечны, назіральнік бачыць кольцападобнае З. Калі Месяц (у поўню) і Сонца аказваюцца ў цэнтралеглых бакоў ад Зямлі і Месяц часткова ці поўнасцю пападае ў цень Зямлі, адбываюцца зацьмені Месяца (рыс. 2). Назіраюцца яны адначасова ва ўсім паўшар'і Зямлі, павернутым да Месяца.



Рыс. 2. Схема зацьмення Месяца.

Да З. у шырокім сэнсе адносяцца пакрыцці зорак і планет (Месяц пры руху закрывае зорку ці планету), праходжанні планет па дыску Сонца (назіраюцца ў Меркурыя і Венеры), З. спадарожнікаў іншых планет, праходжанні ценю спадарожніка па дыску планеты і інш. Дэталёвыя звесткі аб момантах З. і ўмовах іх бачнасці прыводзяцца ў астр. штогодніках.

Літ.: Михайлов А. А. Теория затмений. 2 изд., М., 1954; Шишаков В. А. Солнечное затмение, М., 1966.

ЗАЦЭ́ННЕ, тарфянікавае паселішча эпохі бронзы і неаліту за 2 *км* на З ад в. Зацэнне Лагойскага р-на Мінскай вобл., на левым беразе Цны. Даследавалася М. М. Чарняўскім (1967—68). Пры раскопках выяўлены крамнёвыя і касцяныя прылады працы, рэшткі вастрадонных ляпных пасудзін з грабеньчатым арнаментам. Знойдзеныя рэчы падобныя да знаходак з тарфянікавых паселішчаў Паўн. Беларусі — *Крывіна, Асавец 2-і* і інш.

ЗАЦЭ́ПІН Мікалай Мікалаевіч (н. 16.1.1920, в. Сцежкі Дзяцлянскага пав. Тамбоўскай губ.), беларускі савецкі вучоны ў галіне фізікі неразбуральнага кантролю. Д-р тэхн. н. (1967), праф. (1971). Чл. КПСС з 1958. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Маск. пед. ін-т імя К. Лібкнехта (1940). З 1950 выкладчык Уральскага політэхн. ін-та; з 1954 заг. лабараторыі дэфектаскапіі Ін-та фізікі металаў АН СССР. З 1970 заг. Аддзела фізікі неразбуральнага кантролю АН БССР. Навук. працы па тэорыі магн. і эл.-магн. метадаў і стварэнні аўтаматызаваных сродкаў неразбуральнага кантролю. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Тв.: у кн.— Об электромагнитных методах контроля качества изделий, Свердловск, 1965; Исследования по физике металлов и неразрушающим методам контроля, Мн., 1963.

ЗАЦЯКЛЯ́ССЕ, вёска ў Стайскім с/с Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Перамога». За 15 *км* на З ад Лепеля, 130 *км* ад Віцебска. 227 ж., двароў 57 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Помнік на брацкай магіле 27 сав. воінаў, партызанаў і землякоў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗАЧЫ́СЦЕ, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл., на р. Сха. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Боркі». За 30 *км* на ПнУ ад Барысава, 101 *км* ад Мінска, 16 *км* ад чыг. ст. Прыяміна. 589 ж., двароў 182 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, урачэбная амбулаторыя, аддз. сувязі, сталовая, магазін. Брацкая магіла сав. воінаў і партызанаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗАЧЭ́РНЯ, вёска ў Дабрамысленскім с/с Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса імя Фрунзе. За 13 *км* на ПдЗ ад Лёзна, 50 *км* ад Віцебска. 195 ж., гасп. 61 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗАШЧА́ТЫ, возера ў бас. Тураўляшкі, левага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 0,83 км². Даўж. 2,1 *км*, найб. шыр. 0,6 *км*, сярэдняя 0,4 *км*, найб. глыб. 7 *м*. Катлавіна выцягнута з З на У. Вадазбор (660 км²) узгорысты, складзены з марэны. Возера зарастае; праточнае, у яго ўпадае р. Туржац, сцёк праз пратоку ў воз. Гомель. Водзяцца плотка, акунь, лешч, шчупак, язь, гусцяра і інш.

ЗАЯ́МНАЕ, вёска ў Стаўбцоўскім р-не Мінскай вобл., каля р. Нёман (2 *км*). Цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны Кастрычнік». За 3 *км* на ПнЗ ад Стоўбцаў, 81 *км* ад Мінска, на аўтамаб. дарозе Стоўбцы — Івянец. 1112 ж., двароў 298 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, 2 магазіны. У 1944 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 60 аднавяскоўцам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗА́ЯЦ (лац. Lepus), сузор'е паўд. паўшар'я неба. На тэр. БССР відаць у канцы восені і зімой. Гл. *Зорнае неба*.

ЗА́ЯЦ Уладзімір Іванавіч [н. 22.9 (5.10).1911, в. Гацукі Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Рэсп. парт. школу пры ЦК КП(б)Б (1948). У 1930—41 на сав. і парт. рабоце. У партызанах з ліп. 1941— камандзір групы, камісар атрада, з вер. 1943 камісар *партызанскай брыгады імя А. В. Суворава* Мінскай вобл., адначасова сакратар Грэскага падпольнага РК КП(б)Б (чэрв. 1943 — ліп. 1944). У 1944—64 на парт. і сав. рабоце ў Мінскай вобл. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў в. Карзюкі Мінскага р-на.

ЗА́ЯЦ Якаў Іванавіч [н. 19.3(1.4).1908, мяст. Клічаў Ігуменскага пав. Мінскай губ.], адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Магілёўскай вобл. ў Айч. вайну. З рабочых. Чл. КПСС з 1929. Скончыў Камуніст. ун-т (1933). З 1928 на камсамольскай рабоце, з 1937 у Клічаўскім РК КП(б)Б. З 1941 камісар партыз. атрада. У крас. 1942 выбраны сакратаром Клічаўскага падпольнага РК КП(б)Б. З лютага 1943 чл. Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б, камісар Клічаўскай ваенна-аператыўнай групы. З ліп. 1944 на парт. рабоце. Узнаг. ордэнам Леніна, медалямі. Жыве ў Магілёве.

«ЗА́ЯЦ-БЯЛЯ́К», умоўная назва карнай аперацыі ням.-фаш. захопнікаў супраць партыз. брыгад імя Сталіна, імя Кутузава, імя Чкалава, імя Кароткіна, 1-й Дрысенскай, «За Савецкую Беларусь», «Няўлоўныя», Асвейскай імя Фрунзе, Бел. партыз. дыверсійнай брыгады спец. прызначэння імя Леніна, 3-й і 4-й Бел. партыз. брыгад, некалькіх брыгад і атрадаў з Каліпінскай вобл., Асобнага латышскага партыз. атрада і мірнага насельніцтва.

Праводзілася на З ад чыгункі Полацк — Невель з 28.1 да 13.2.1943 сіламі 4 палкоў 201-й ахоўнай дывізіі, батальёна 8-га паліцэйскага палка, часткі гарнізонаў Себежа, Ідрыцы, Пустошкі, Новахаванска і спец. гасп. атрадаў. Акупанты наступалі па збежных кірунках з р-наў воз. Язна і станцыі Дрэтунь з мэтай прыціснуць партызанаў да чыгункі Полацк — Ідрыца і знішчыць сустрэчным ударам з боку воз. Асвейскае. Аб'яднаныя сілы партызанаў 11 лют. перайшлі ў контрнаступленне і выцеснілі праціўніка з Расонскага р-на. Але 14.2. 1943 пачалася карная аперацыя *«Зімовая казка»*. За час карнай аперацыі «З.-б.» карнікі знішчылі, паводле няпоўных звестак, 877 мірных жыхароў.

У. С. Пасэ, А. А. Фактаровіч. Мінск.

ЗБА́РАВІЧЫ, гарадзішча *штрыхаванай керамікі культуры* каля в. Збаравічы Мінскага р-на. Даследавалася А. Р. Мітрафанавым (1952). Пры раскопках выяўлены рэшткі доўгіх жытлаў слупавой канструкцыі з адкрытымі агнішчамі, жал. прылады працы, бронзавыя ўпрыгожанні, каменныя зерняцёркі, рэшткі печаў-домніц, вастрадонныя і слоікападобныя ляпныя пасудзіны. Іл. гл. на ўкл. да арт. *Жалезны век*.

Літ.: Очерки по археологии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1970.

ЗБАРО́Ў, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл., на левым беразе Дняпра. Цэнтр сельсавета і калгаса «Новы шлях». За 12 *км* на ПнУ ад Рагачова, 133 *км* ад Гомеля, на аўтамаб. дарозе, якая злучае вёску з Рагачо-

вам. 841 ж., гасп. 256 (1971). Мех. майстэрня. Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. 2 помнікі: воінам-землякам і на брацкай магіле 60 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗБЕЖНАСЦЬ, уласцівасць паслядоўнасці лікаў, пунктаў, функцый і іншых матэм. аб'ектаў імкнуцца да *граніцы*. Паслядоўнасці часта ўзнікаюць у працэсе прыбліжанага вылічэння пэўнай велічыні, напр., перыметры ўпісаных у круг многавугольнікаў пры неабмежаваным памяншэнні даўжыні старон збягаюцца (сыходзяцца) да даўжыні акружнасці.

Граніцай паслядоўнасці каранёў якога-н. ураўнення пры рашэнні яго метадам паслядоўных прыбліжэнняў з'яўляецца корань ураўнення. Калі паслядоўнасць частковых сумаў бесканечнага раду мае граніцу, то рад наз. збежным, а гэта граніца ёсць сума раду. Выводзіцца шэраг адзнак З. радоў. Паняцце З. дастасавальнае не толькі да лікавых, але і да паслядоўнасцей іншых аб'ектаў, напр., паслядоўнасці функцый, пунктаў, абласцей, да бесканечных матрыц, бесканечных вызначальнікаў і інш. Акрамя выкладзенага класічнага паняцця З., ужываюцца розныя яго абагульненні. Напр., калі паслядоўнасць $S_1, S_2, \ldots S_n, \ldots$ частковых сумаў раду не мае граніцы і, значыць, рад у звычайным сэнсе разыходзіцца, але паслядоўнасць $\sigma_n = \frac{S_1 + S_2 + S_3 + \ldots + S_n}{n}$ збягаецца, тады кажуць, што гэты рад збягаецца ў сэнсе сярэдняга арыфметычнага. *Ф. Дз. Гахаў.* Мінск.


ЗБІРАЛЬНІЦТВА, адна з формаў гасп. дзейнасці чалавека на першых стадыях развіцця грамадства (гл. *Першабытнаабшчынны лад*), засн. на збіранні прыроднага харчу.

Узнікла ў эпоху палеаліту, існавала побач з рыбалоўствам і паляваннем, папярэднічала матычнаму земляробству. Пры З. карысталіся спец. прыладамі: кійком-капачкай у выглядзе лапаткі з завостраным канцом, грабеньчатым чарпаком і інш. З. зберагло ў непаўналізаваных народаў. У больш позніх гістар. эпохі набыло форму промыслу.

ЗБІРОЖСКАЯ ЦАРКВА, помнік драўлянага дойлідства 18 ст. Пабудавана ў в. Збірогі (Брэсцкі р-н). У плане — выцягнуты прамавугольнік з алтарнай прыбудовай, якая крыху выдаецца на Пд; бакавыя памяшканні прыбудовы маюць удвая меншую вышыню. З зах. боку царквы — бабінец з хорамі і тамбур. Кампактны па аб'ёме храм накрыты паўвальмавым дахам з невялікім купалком (крыху адсунутым да алтарнай часткі) на 8-гранным барабане. Паўвальмавы дах (мансардна-шатровай вышыні) мае і алтарная прыбудова. Рубленыя з пласцін і вертыкальна ашалёўкай дошкамі сцены маюць высока размешчаныя вокны. Квадратная ў плане каркасная званічка з шатровым дахам пастаўлена асобна. *А. Л. Міцяніх.* Брэст.

Збірожская царква. Агульны выгляд і план.





ЗБІЦЕНЬ, гарачае піво, пашыранае ў Расіі і на Беларусі ў 18—19 ст. У кіпень з мёдам, цукрам ці патакаю дадавалі перац, гваздзіку, карыцу, мускатны арэх, лаўровы ліст і інш., часам піва ці спірт. У Расіі З. гатавалі ў самавары. У нар. медыцыне — сродак папярэджання цынгі.

ЗБЛЯНЫ, вёска ў Беліцкім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл., на р. Нёман. Цэнтр калгаса «Гігант». За 38 *км* на Пд ад Ліды, 122 *км* ад Гродна, 15 *км* ад чыг. ст. Нёман. 385 ж., гасп. 119 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. Помнік сав. воінам, якія загінулі ў Айч. вайну.

Каля З., на правым беразе Нёмана, ёсць мезалітычнае паселішча. Даследавалася М. М. Чарняўскім (1965—70). Пры раскопках знойдзены крэсівныя і невялікія крамянёвыя прылады працы: нуклеусы, канцавыя скрабкі, разцы, пакапечнікі стралаў, сякеры, укладышы. Падобныя знаходкі трапляюцца на мезалітычных помніках Зах. Беларусі і Паўд. Літвы.

ЗБОЖЖАВАЯ ГАСПАДАРКА, найважнейшая галіна с. гасп. па вытворчасці збожжавых шляхам вырошчвання *збожжавых культур*. Аснова забеспячэння насельніцтва хлебнымі прадуктамі. Дае таксама сыравіну многім галінам прамысловасці, канцэнтраты, грубыя кармы і подсцілкі жывёле.

Да Кастр. рэв. асн. масу таварнага збожжа давалі памешчыцкія і кулацкія гаспадаркі. Калгасы і саўгасы БССР вырошчваюць 95% збожжавых і даюць 100% дзярж. іх закупак. Асн. збожжавыя культуры ў структуры пасяўных плошчаў Беларусі: азімыя — жыта і пшаніца; яравыя — ячмень, авёс, пшаніца, грэчка, проса, лубін і інш. (гл. табл. 1). Найб. пашыраныя сарты: жыта — Белта, Харкаўскае-60, Дружба, Беняконскае; пшаніцы азімай — Міронаўская-808, яравой — Мінская; ячменю — Маскоўскі-121, Альза (для тарфяна-балотных глебаў); аўса — Надзейны; грэчкі — Церахоўская мясцовая; лубіну кармавога на зерне — Хуткаруслы-4. У БССР збожжавыя культуры займаюць каля паловы пасяўной плошчы. Беларусь, якая мае 2,8% worных зямель ад агульнасаюзнай плошчы, дае 2,3% агульнасаюзнай вытворчасці збожжа. У 1971—75 валавы збор збожжа ў БССР намечана давесці да 7 млн. *т* пры ўраджайнасці 27—28 *ц/га*. Аднак для поўнага задавальнення патрэб насельніцтва ў хлебапрадуктах і патрэб камбікормавай прамысловасці рэспублікі трэба амаль 10 млн. *т* збожжа ў год, таму ў 10-й пяцігодцы плануецца павысіць ураджайнасць збожжавых прыкладна да 35 *ц/га*.

Табліца 1

Структура пасяўных плошчаў збожжавых культур на Беларусі (у %)

Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак	Гады				
	1913	1940	1960	1965	1970
Усе збожжавыя культуры	100	100	100	100	100
у тым ліку:					
жыта азімае	54,2	45,1	55,2	59,3	34,3
пшаніца азімая	1,5	2,2	2,3	5,9	17,4
пшаніца яравая	0,9	5,4	4,0	0,6	0,2
ячмень яравы	9,8	10,8	9,6	13,8	28,6
авёс	23,9	22,9	15,4	6,8	11,1
грэчка	5,4	7,0	5,1	3,3	1,6
проса	0,7	1,4	0,3	0,3	0,1
зернебабовыя і інш.	3,6	5,2	8,1	10,0	6,7

З. г. — самая механізаваная галіна с. гасп. Поўнасцю механізаваны апрацоўка глебы, сяўба, уборка, ачыстка і сушка збожжа. Павышаецца культура земляробства: больш ужываецца арган. і мінер. угнаенняў, ваннуюцца кіслыя глебы, паляпшаецца апрацоўка палёў, укараняюцца высокаўраджайныя сарты, удасканальваецца структура пасеваў. Гэта забяспечвае павышэнне ўраджайнасці, павелічэнне валавых збораў збожжа (гл. табл. 2).

Табліца 2

Пасяўныя плошчы, ураджайнасць і валавы збор збожжавых культур на Беларусі


Ва ўсіх катэгорыях гаспадарак	Гады						
	1913	1940	1945	1950	1960	1965	1970
Пасяўная пл., тыс. *га*	3630	3476	2829	3392	2590	2890	2505,3
Удзельная вага збожжавых культур у агульнай пасяўной плошчы, %	79,0	66,7	73,6	69,0	45,7	47,9	41,4
Ураджайнасць, *ц/га*	7,1	8,0	6,1	7,9	8,4	11,5	16,9
Валавы збор, тыс. *т*	2568	2727	1703	2684	2165	3336	4239,5

У СССР у 1970 збожжавыя культуры займалі 57,7% пасяўной плошчы, ураджайнасць — 15,6 *ц/га* (у 1913 — 8,2 *ц/га*), валавы збор — 186,4 млн. *т* (у 1913 — 86 млн. *т*). Асн. раёны вытворчасці збожжа — Украіна, Казахстан, Сібір, Урал, Паволжа, Паўн. Каўказ, Цэнтр. чарназёмная вобл. РСФСР. Па валавым зборы збожжа СССР займае 2-е (пасля ЗША) месца ў свеце. У 1971—75 запланавана давесці сярэднегадавую вытворчасць збожжа мінімум да 195 млн. *т*, а яго закупкі — да 80—85 млн. *т*. З сацыяліст. краін найб. плошчы пад збожжавымі ў Польшчы, Румыніі, Югаславіі, а капіталіст. — у ЗША, Канадзе, Францыі.

Літ.: Мартинкевич Ф. С. Размещение и специализация сельского хозяйства Белорусской ССР, Мн., 1961; Гусаков В. А. Экономика производства зерна, Мн., 1967; Белорусская ССР за 50 лет. Стат. сб., Мн., 1968; Козьмина Н. П. Зерно, М., 1969; Воробьев Г. И. Экономика и организация производства зерна, М., 1965.

Ф. С. Марцінкевіч. Мінск.

ЗБОЖЖАВЫ КАМБАЙН, с.-г. машына для ўборкі збожжавых культур. Абсталяваная адпаведнымі прыстасаваннямі, можа выкарыстоўвацца пры раздзельным спосабе ўборкі для падбірання валкоў, уборкі зернебабовых, крупяных, алейных культур, пасеннікаў траў і інш.



Збожжавы камбайн СК-5 «Ніва».

З. к. падзяляюцца: па спосабе агрэгатавання — на прычэпныя (С-6, РСМ-10), самаходныя (СК-4, СК-5, СКД-5 і інш.), навясныя (НК-4); па тыпе хадавой часткі — на колавыя (СК-4), паўгусенічныя (СКП-4) і гусенічныя (СКГ-4); па колькасці барабанаў — на адна- (СК-4, СК-5) і двухбарабанныя (СКД-5). Самаходныя З. к. СК-5 «Ніва» (гл. рыс.) складаюцца з хедара (жатны апарат), малатарні, капнаўшчыка, хадавой часткі, механізмаў кіравання і рухавіка. Хедар размешчаны франтальна, што дае магчымасць працаваць ім як пракосчыкам; капіруе рэльеф поля ў папярочным і падоўжным напрамках. Мае рэзальны апарат (рыс. гл. пры арт. *Жнярка*), эксцэнтрыкавае мнагіла, шнэк для транспартавання зрэзанай масы і зменныя дзельнікі. Малатарня складаецца з малацільнага апарата (барабана і дэкі), чатырохклавішнага саламатрэса, грохата, двухрэшатнай ачысткі і зернявога бункера. Прапускная здольнасць малатарні да 5 *кг/сек*. Капнаўшчык навясны, механізаваны, з аўтам. скіданнем капы саломы; ёмістасць 9 $м^3$. Рухавік дызельны, магутнасцю 74 *кэт* (100 к. с.). Камбайн абсталяваны гідраул. сістэмай, якая аблягчае кіраванне ім пры жніве. Скорасць руху да 19,5 *км/гадз*. Двухбарабанны З. к. СКД-5 эфектыўны на ўборцы вільготнага збожжа і збожжа, якое цяжка абмалочваецца.

У БССР збожжавыя і зернебабовыя культуры ўбіраюцца пераважна непасрэдным камбайнаваннем. Парк З. к. камплектуецца для ўборкі культур (жыта і ячмень), якія адначасова выспяваюць, з разліку да 70 *га* на камбайн. Гл. таксама *Камбайнабудаванне*.

Літ.: Сельскохозяйственная техника. Каталог, 3 изд., М., 1967.

В. І. Лосеў. Мінск.

ЗБОЖЖАВЫЯ КУЛЬТУРЫ, найважнейшая група культурных раслін, якія даюць асноўны прадукт харчавання — хлеб, канцэнтраваныя і грубыя кармы для жывёлагадоўлі, сыравіну для прамысловасці.

Падзяляюцца на: хлебныя З. к., *зернебабовыя культуры* і алейныя З. к. (належаць да тэхн. культур). Хлебныя З. к. — пераважна расліны сям. злакавых (*жыта, пшаніца, ячмень, авёс, проса, кукуруза*, сорга, рыс), а таксама *грэчка* з сям. грэчкавых. Па біял. уласцівасцях і характары выкарыстання хлебныя З. к. падзяляюцца на тыповыя (жыта, пшаніца, авёс, ячмень) і просападобныя

(проса, кукуруза, сорга, рыс), а па форме суквецця — на коласападобныя (пшаніца, жыта, ячмень) і мяцёлчатыя (авёс, сорга, рыс); у кукурузы 2 тыпы суквецця ў — мужчынскае (мяцёлкі ўверсе расліны) і жаночае (цыліндрычныя катахі ў пазухах лісця). У хлебных З. к. паводле тыпу развіцця і працягласці вегетацыі адрозніваюць формы: азімыя (азімая пшаніца, азімае жыта, азімы ячмень) і яравыя (яравая пшаніца, авёс, ячмень, кукуруза, проса, сорга, рыс, грэчка). Насенне ўсіх хлебных З. к. багатае на крухмал (50—75%) і бялок (7—20%). Гал. хлебныя расліны амаль усяго шара — пшаніца, рыс, кукуруза. На Беларусі вырошчваюць азімае жыта, азімую і яравую пшаніцу, ячмень, авёс, грэчку, проса. Гл. таксама *Збожжавая гаспадарка*.

Літ.: Вавилов Н. И. Пшеница, М.— Л., 1964 (Мировые ресурсы сортов хлебных злаков, зерновых бобовых, льна и их использование в селекции); Корнилов А. А. Биологические основы высоких урожаев зерновых культур, М., 1968; Никитенко Г. Ф. Биологические основы семеноводства зерновых культур, М., 1968. *Б. М. Прусакова.* Мінск.

«ЗБОР ВЕСЦЯЎ ДА АНТРАПАЛО́ГІІ КРАЁВАЙ» («Zbiór wiadomości do antropologii krajowej»), ілюстраваны штогоднік, орган Антрапалагічнай камісіі Польскай АН. Выходзіў у Кракаве з 1877 да 1895 (укл.) на польскай мове. Разлічаны на даследчыкаў (археолагаў, этнографаў, антраполагаў, фалькларыстаў) і шырокае кола чытачоў. Змяшчаў матэрыялы па культуры польск., бел., літ., лат., яўр. і інш. народаў; бібліяграфію па археалогіі, антраполагіі, этнаграфіі, фальклоры. У часопісе публікавалі свае працы па бел. фальклоры, этнаграфіі, антраполагіі З. Глогер, У. Дыбоўскі, Ян Карловіч, У. Вярыга, І. А. Бадуэн дэ Куртэне, Бірута (Амелія Даравінская), Ю. Талька-Грынцэвіч, паэт А. Гурыновіч, чэш. філолаг А. Чэрны і інш. Выйшла 18 тамоў. *Н. А. Ляшковіч.* Вільнюс.

ЗБО́РАЎСКІ ДАГАВО́Р 1649, паміж гетманам Б. Хмяльніцкім і польскім каралём Янам II Казімірам. Падпісаны 8(18).8.1649 у маёнтку каля г. Зборава.

Хмяльніцкі пайшоў на мір пад націскам крымскага хана Іслам-Гірэя III, які здрадзіў яму і пагражаў у выпадку нязгоды перайсці на бок палякаў. Паводле З. д. Украіна аставалася ў Рэчы Паспалітай. Польская шляхта вярталася ў маёнткі. Казацкае войска размяшчалася толькі ў Кіеўскім, Чарнігаўскім і Брацлаўскім ваяводствах. Колькасць рэестравых казакоў вызначалася ў 40 тыс., астатнія пераходзілі ў прыгонныя. Пытанне пра скасаванне *Брэсцкай уніі 1596* перадавалася на разгляд сейма. Палякі лічылі З. д. вялікай уступкай Хмяльніцкаму і не выконвалі яго ўмоў. Гэта выклікала незадаволенасць нар. мас Украіны і прывяло ў пач. 1651 да аднаўлення ваен. дзеянняў.

Кр.: Воссоединение Украины с Россией. Документы и материалы, т. 2, 1648—1651 годы, М., 1953.

Літ.: Воссоединение Украины с Россией. 1654—1954. Сб. ст., М., 1954. *Л. М. Лыч.* Мінск.

ЗБО́РНА-МАНАЛІ́ТНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ, буд. канструкцыі, у якіх элементы, зробленыя на заводзе, злучаюць (маналіцваць) у адно цэлае на месцы буд-ва. Гл. *Жалезабетонныя канструкцыі, Зборныя канструкцыі.*

ЗБО́РНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ (у будаўніцтве), канструкцыі будынкаў і збудаванняў, якія вырабляюцца на заводах ці палігонах і не патрабуюць дадатковай апрацоўкі на будаўнічай пляцоўцы.

Выкарыстанне З. к.— аснова індустрыялізацыі буд-ва: зніжае працаёмкасць і кошт, павышае якасць, ліквідуе ручную працу і сезоннасць буд-ва, спрыяе комплекснай механізацыі і аўтаматызацыі буд. вытворчасці. З. к. робяцца з *жалезабетону*, металу, драўніны (гл. *Драўляныя канструкцыі*) і інш. З. к., асабліва з жалезабетону і бетону, найб. эфектыўныя пры вялікай паўторнасці аднатыпных элементаў у жыллёвым, прамысловым, камунальным і транспартным буд-ве (гл. *Буйнаблочныя канструкцыі, Буйнапанельныя канструкцыі*). У БССР пашырана буйнаблочнае і буйнапанельнае домабудаванне, буд-ва дамоў з аб'ёмных блокаў (гл. *Аб'ёмнаблочнае будаўніцтва*); распаўсюджаны шэраг відаў зборных жалезабетонных канструкцый (панелі сумяшчальных дахаў, армаванага настылавыя панелі пакрыццяў, канструкцыі з лёгкіх бетону і інш.). Гл. таксама *Будаўніцтва, Будаўнічая індустрыя.*

Літ.: Сахновский К. В., Горештейн Б. В. и Липецкий В. Д. Сборные тонкостенные пространственные и большепролетные конструкции, Л., 1969; Российский В. А. и др. Примеры проектирования сборных железобетонных мостов, 2 изд., М., 1970. *Л. К. Лукша.* Мінск.

ЗБО́РСК, два гарадзішчы ў в. Зборск Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., на левым беразе Свіслачы. Першае гарадзішча складаецца з 2 невял. пляцовак, падзеленых валам, другое — авальнай формы. Даследавалі А. Немцаў, С. С. Шутаў, М. М. Улашчык, Л. Д. Побаль і інш. Знойдзеныя рэчы (жал. прылады працы, кераміка) даюць падставу сцвярджаць, што гарадзішчы ўзніклі ў зоне кантактаў плямёнаў, якія жылі на тэр. Паўд. Беларусі (мілаградская і зарубінецкая культуры) і Цэнтр. Беларусі (культура штрыхаванай керамікі).

Літ.: Немцаў А. Помнікі старасветчыны ў Асіповіцкім раёне, у кн.: Асіповіцкі раён Бабруйскі акругі, в. 2, Мн., 1928. *Л. Д. Побаль.* Мінск.

ЗБО́ЧНА, гарадзішча з магутнымі абарончымі збудаваннямі на З ад в. Збочна Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. Даследавалі Е. Міхайлоўскі (1892), Ф. Д. Гурэвіч (1955), П. А. Рапапорт (1959). Мае круглую форму дыяметрам 50 *м*, умацавана 2 валамі і ровам. Знойдзеныя рэчы (кружальная кераміка, абломкі цэглы і косці свойскіх жывёл) даюць падставы меркаваць, што З. адносіцца да 11—14 ст. і, мабыць, з'яўлялася сядзібай феадала.

Літ.: Гуревич Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья, М.— Л., 1962.

ЗБРОЯ, сукупнасць сродкаў паражэння праціўніка, гал. састаўная частка *ўзбраення*. У залежнасці ад прызначэння і тэхнічна-баявых якасцей сучасная З. падзяляецца на халодную (гл. *Халодная зброя*), агнястрэльную (гл. *Аўтаматычная зброя, Стралковая зброя, Артылерыя, Мінамёт*), мінна-выбуховую (гл. *Бомба, Граната, Міна*), ракетную (гл. *Ракетная зброя*), ядзерную (гл. *Ядзерная зброя*), хімічную (гл. *Хімічная зброя*), біялагічную (гл. *Біялагічная зброя*). Па прыналежнасці роду войск ці віду ўзброеных сіл адрозніваюць стралковую, артылерыйскую, авіяцыйную, танкавую, ракетную, марскую і інш. Па забеспячэнні адпаведных баявых задач дзеліцца на стратэгічную, аператыўна-тактычную і тактычную, у залежнасці ад колькасці персаналу ў карыстанні З.— на групавую (калектыўную) і асабістую (індывідуальную).

З. ўзнікла ў палеаліце, існавала як універсальная прылада-зброя (каменнае ручное рубіла, каменны нож) для прымітыўнай апрацоўкі дрэва, паляўвання і самаабароны. У гэтую эпоху з'явіліся спец. віды З. (дубіна, або пáліца, кап'ё, бола, праша), адбыўся падзел З. на ўдарную і кідальную. З пач. мезаліту вядомы лук і стрэлы, з неаліту — сякера, булава, кінжал. Пры рабаўладальніцкім ладзе пачалі карыстацца кідальнымі машынамі, асаднымі (баліста, катапульта), сценабітнымі машынамі (тараны), падпальнай сумессю — грэчаскі агонь. З'явіліся спец. групы ўзброеных людзей для ваен. нападу і абароны (гл. *Армія*). З бронзавага веку вядомыя меч, чакан, баявая сякера і ле разнавіднасці, з 8—9 ст.— шабля, з 16—19 — шпага. Вынаходка пораху дала пачатак агнястрэльнай З., якая зрабіла пераварот у ваен. справе: змянілася арганізацыя войск, ваен. майстэрства, зніклі ўстарэлыя віды З. У канцы 19 ст. сканструявана аўтаматычная зброя, у пач. 20 ст.— авіяцыйная і танкавая зброя. У Айч. вайну ўзбраенне Сав. войск папоўнілася рэактыўным мінамётам — пачатковым сучаснай ракетнай З. У канцы 2-й сусв. вайны ў ЗША створана і выкарыстана для бамбардзіроўкі Хіросімы і Нагасакі атамная бомба. З'явіўся новы сродак масавага паражэння жывой сілы праціўніка — баявыя радыеактыўныя рэчывы і біялагічная З. З развіццём навук.-тэхн. прагрэсу ўдасканальваюцца ўсе віды З. Асновай узбраення войск стала ракетная З. Імперыял. дзяржавы назапашваюць З. для агрэс. войнаў, задушэння нац.-вызв. руху, ажыццяўлення палітыкі «з пазіцыі сілы». СССР, маючы ўсе віды сучаснай З., неабходнай для аховы сваіх граніц і краін сацыялістычнага лагера, паслядоўна выступае за ўсеагульнае і поўнае разбраенне.

Літ.: Гл. пры адпаведных арт. пра віды З.

У. С. Чыжоў. Мінск.

ЗБРО́Я МАСАВАГА ПАРАЖЭ́ННЯ, зброя вялікай разбуральнай і паражальнай сілы, прызначаная для прычынення масавых страт праціўніку. Уключае *ядзерную зброю, хімічную зброю* і *біялагічную зброю*.

ЗБРУЦКІ ІДАЛ, выява славянскага язычніцкага бажаства 10 ст. Знойдзены ў 1848 у рэчышчы р. Збруч (левы прыток Днястра) каля г. Гусяціна.

З. і.— чатырохгранны слуп з шэрага вапняку вышынёй 267 *см*, кожная грань якога мае барэльефныя твары слав. бажаствaў. Большасць даследчыкаў лічыць З. і. стараж.-слав. культавай скульптурай, якая была скінута ў раку, мабыць, пасля хрышчэння насельніцтва. Польскі археолаг Я. Росен-Пшаворская звязвае З. і. з кельцкімі плямёнамі. Зберагаецца ў Кракаўскім археал. музеі, копія ў Гістар. музеі ў Маскве.

Літ.: Гуревич Ф. Д. Збручский идол, М.— Л., 1941 (Материалы и исследования по археологии СССР, № 6). *Я. Г. Зверуга.* Мінск.

ЗБУ́РАЖ, вёска ў Гвозніцкім с/с Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. Цэнтр калгаса «40 гадоў БССР». За 7 *км* на ПдЗ ад Маларыты, 55 *км* ад Брэста. 1126 ж., двароў 345 (1971). Цагельня. Сярэдняя школа, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. У 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік 54 адпавяскоўцам — воінам і партызанам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну, і 24 мірным жыхарам З., якіх расстралялі ням.-фаш. захопнікі.

ЗВАДКАВА́ННЕ ГАЗАЎ, працэс пераводу газападобных рэчываў у вадкі стан. Дасягаецца ахаладжэннем іх ніжэй за т-ру кіпення або сціскáннем (каб павысіць *t* кіп.) з наступнай кандэнсацыяй у цеплаабменніках. Вадкія газы выкарыстоўваюцца для раздзялення газавых сумесей, атрымання нізкіх т-р, для тэхнал. мэт (газавая зварка), як паліўныя сумесі рэактыўных рухавікоў і інш. Для прамысл. і бытавых мэт ужываюцца пераважна звадкаваныя вуглевадародныя газы (прапан C_3H_8, бутан C_4H_{10}). Яны аддзяляюцца ад спадарожных прыродных газаў (у

БССР — на Полацкім нафтаперапрацоўчым з-дзе). Працэсы З. г. выкарыстоўваюцца пры вырабе мінер. угнаенняў (Гродзенскі хім. камбінат імя С. В. Прытыцкага, Гомельскі хім. з-д). Зручнасць транспартавання і хавання вызначылі пашырэнне вадкіх газаў у многіх галінах пар. гаспадаркі.

Упершыню газы з крытычнай т-рай (*t* кіп.), вышэйшай за т-ру навакольнага асяроддзя (аміяк, хлор, вуглякіслы газ і інш.), былі звадкаваны М. Фарадэем (1823). Вадкі кісларод, азот і воніс вуглякіслы атрыманы ў 1877 швейц. вучоным Р. Піктэ і незалежна ад яго франц. вучоным Л. Кальетэ; вадкі вадарод — у 1898 англ. вучоным Дж. Дэьюарам. У 1908 галанд. вучоны Г. Камерлінг-Онес атрымаў вадкі гелій — газ з найніжэйшай т-рай кіпення (−268,9 °С). Першы метад З. г. (азоту, кіслароду і інш.) быў каскадны, прапанаваны Р. Піктэ ў 1877 і ўдасканалены Г. Камерлінг-Онесам у 1892. Заключаецца ў паслядоўным (ступеньчатым) звадкаванні некалькіх газаў з рознымі т-рамі кіпення, калі пры выпарванні аднаго газу (ахаладжэнне) кандэнсуецца другі з больш нізкай т-рай кіпення. У першым каскадзе звычайна выпарваецца аміяк, які звадкоўвае этылен. Пры выпарванні этылену (ахаладжэнне да −100 °С) звадкоўваецца сціснуты кісларод. Так можна звадкаваць вадарод у пятым, гелій — у шостым каскадзе. Гэты спосаб З. г. пашыраны пераважна ў лабараторнай практыцы. Прамысл. метады З. г. заснаваны на выкарыстанні *Джоўля — Томсана эфекту* (ахаладжэнне сціснутага газу пры расшырэнні яго праз вентыль — метад драселявання) і на выкарыстанні ахаладжэння газу пры расшырэнні яго ў спец. машыне — поршневым дэтандэры або турбадэтандэры акад. П. Л. Капіцы (метад ахаладжэння з выкананнем знешняй работы). Пры камбінаваным метадзе З. г. (такіх, як аміяк, хлор) робіцца сціскáннем іх у кампрэсары і ахаладжэннем у кандэсатары.

Літ.: Техника низких температур, М.— Л., 1964; Гельперин И. И., Зеликсон Г. М. и Рапопорт Л. Л. (сост.). Справочник по разделению газовых смесей методом глубокого охлаждения, 2 изд., М., 1963; Одельский Э. Х. Газоснабжение, Мн., 1966; Вешицкий В. А. и Жилина Л. В. (сост.). Промышленность сжиженных газов за рубежом. Обзор зарубежной литературы, М., 1968. *Э. Х. Адэльскі.* Мінск.

ЗВАЛЬНЕ́ННЕ, скасаванне працоўнага дагавору паміж рабочым або служачым і прадпрыемствам (установай).

Паводле прац. заканадаўства рабочым і служачым, якія заключылі прац. дагавор на нявызначаны тэрмін, могуць звольніцца ў любы час, але абавязаны папярэдзіць пра гэта адміністрацыю за два тыдні да З. Тэрміновы прац. дагавор можна датэрмінова скасаваць у выпадках, прадугледжаных законам (хвароба, інваліднасць, парушэнне адміністрацыяй заканадаўства аб працы і інш.). Работнік таксама звальняецца, калі прызываецца ці паступае на вайск. службу, пераводзіцца на інш. работу, пераходзіць на выбарную пасаду, адмаўляецца ад пераводу ў інш. мясцовасць разам з прадпрыемствам, установай, арг-цыяй. З. па патрабаванні адміністрацыі дапускаецца пры папярэдняй згодзе ФЗМК прафсаюзаў, калі ліквідуецца прадпрыемства, установа, арг-цыя, скарачаецца штат работнікаў; калі рабочы або служачы не адпавядае рабоце; сістэматычна не выконвае без уважлівых прычын прац. абавязкаў; прагульвае без уважлівых прычын (у т. л. прыходзіць на работу нецвярозы); не працуе з-за хваробы больш як 4 месяцы (пры пэўных хваробах заканадаўствам прадугледжваецца і больш доўгі тэрмін захавання месца працы); калі аднаўляецца на рабоце ў вызначаным законам парадку работнік, які раней выконваў гэтую работу. Работнік можа быць звольнены па патрабаванні прафсаюзнага органа (не ніжэй раённага), а таксама, калі набывае законную сілу прыгавор суда.

Кр.: Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб працы, «Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР», 1970, № 29, арт. 265.

Літ.: Вочков А. Ф. Расторжение трудового договора, Мн., 1971. *А. Ф. Бачкоў.* Мінск.

ЗВА́НАЕ, возера ў бас. Дрысы, правага прытока Зах. Дзвіны, у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,31 *км*². Даўж. 1,9 *км*, найб. шыр. 1 *км*, сярэдняя 0,6 *км*. Схілы спадзістыя, на ПдУ і каля вытоку р. Званіцы забалочаныя, параслі лесам і хмызняком. Вадазбор (8,5 *км*²) слабахвалісты. Сцёк праз Званіцу ў р. Дрысу. Водзяцца карась, плотка, акунь, шчупак.

ЗВАНЕ́Ц (Rhinanthus), род аднагадовых паўпаразітных травяністых раслін сям. залозпікавых. Вядома каля 100 відаў, пашыраных у Паўн. паўшар'і, пераважна ў Еўропе. У СССР 25 відаў, на Беларусі 6.



Званец вялікі: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — кветка; *3* — плод; *4* — ліст.

Сцябло голае ці апушанае, выш. 5—50 (80) *см*. Лісце зубчастае, супраціўнае. Кветкі светла-жоўтыя, жоўтыя, фіялетавыя, сабраныя ў рэдкія коласападобныя суквецці. Плод — каробачка. На Беларусі найб. пашыраныя: З. малы (Rh. minor, нар. назвы: ключыкі, грамкі), З. вялікі (Rh. major, нар. назвы: дзвонец, званкі, смактушкі) — шкоднае пустазелле сенажацяў і пашы; З. бяскрылы (Rh. apterus) — пустазелле азімых культур. Меры барацьбы: скошванне травастою да ўтварэння насення З., ачыстка насення азімых збожжавых, праполка пасеваў, сяўба насеннем леташняга года.

Літ.: Котт С. А. Сорные растения и борьба с ними, М., 1969.

ЗВАНЕ́Ц, вёска ў Рагачоўскім р-не Гомельскай вобл. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Бальшавік». За 40 *км* на ПнУ ад Рагачова, 100 *км* ад Гомеля, 16 *км* ад прыстані Свярдлоўск на Дняпры, на аўтамагістралі Ленінград — Адэса. 1205 ж., двароў 370 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, адда. сувязі, магазін. У 1942 вёску часткова спалілі нямецка-фаш. захопнікі. Помнік воінам-землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

Воінскія званні ва Узброеных Сілах СССР

Сухапутныя войскі і ваенна-паветраныя сілы	Ваенна-марскі флот
Салдаты	**Матросы і салдаты**
Радавы	Матрос, радавы
Яфрэйтар	Старшы матрос, яфрэйтар
Сяржанты	**Старшыны і сяржанты**
Малодшы сяржант	Старшына 2-й статні, малодшы сяржант
Сяржант	Старшына 1-й статні, сяржант
Старшы сяржант	Галоўны старшына, старшы сяржант
Старшына	Мічман, старшына
Малодшыя афіцэры	
Малодшы лейтэнант, малодшы інжынер-лейтэнант, малодшы тэхнік-лейтэнант	Малодшы лейтэнант, малодшы інжынер-лейтэнант, малодшы тэхнік-лейтэнант
Лейтэнант, інжынер-лейтэнант, тэхнік-лейтэнант	Лейтэнант, інжынер-лейтэнант, тэхнік-лейтэнант
Старшы лейтэнант, старшы інжынер-лейтэнант, старшы тэхнік-лейтэнант	Старшы лейтэнант, старшы інжынер-лейтэнант, старшы тэхнік-лейтэнант
Капітан, інжынер-капітан, капітан тэхнічнай службы	Капітан-лейтэнант, інжынер-капітан-лейтэнант, капітан, інжынер-капітан
Старшыя афіцэры	
Маёр, інжынер-маёр, маёр тэхнічнай службы	Капітан 3-га рангу, інжынер-капітан 3-га рангу, маёр, інжынер-маёр
Падпалкоўнік, інжынер-падпалкоўнік, падпалкоўнік тэхнічнай службы	Капітан 2-га рангу, інжынер-капітан 2-га рангу, падпалкоўнік, інжынер-падпалкоўнік
Палкоўнік, інжынер-палкоўнік, палкоўнік тэхнічнай службы	Капітан 1-га рангу, інжынер-капітан 1-га рангу, палкоўнік, інжынер-палкоўнік
Генералы	**Адміралы і генералы**
Генерал-маёр*	Контр-адмірал, інжынер-контр-адмірал, генерал-маёр
Генерал-лейтэнант*	Віцэ-адмірал, інжынер-віцэ-адмірал, генерал-лейтэнант
Генерал-палкоўнік*	Адмірал, інжынер-адмірал, генерал-палкоўнік
Генерал арміі	—
Маршалы	
Маршал роду войск — маршал авіяцыі	—
Галоўны маршал роду войск — галоўны маршал авіяцыі	—
Маршал Савецкага Саюза	Адмірал флоту Савецкага Саюза

* З дабаўленнем назвы роду войск ці авіяцыі і спец. службаў.

ЗВА́ННІ, спец. або ганаровыя найменні, якія прысвойваюцца асобам, каб адзначыць іх навук., вытв., службовую кваліфікацыю і заслугі перад дзяржавай. Парадак прысваення З., правы і абавязкі асоб, што іх атрымалі, вызначаюцца спец. палажэннем пра *званні ганаровыя, званні воінскія, званні спартыўныя* і інш.

ЗВА́ННІ ВОІНСКІЯ, званні, якія персанальна прысвойваюцца ваеннаслужачым арміі і флоту ў адпаведнасці з іх ваеннай кваліфікацыяй, службовым становішчам, заслугамі, ваеннай і спец. падрыхтоўкай, а таксама прыналежнасцю да пэўнага роду войск ці віду службы. Вызначаюць старшынство ў службовых адносінах паміж ваеннаслужачымі і падзяляюцца на салдацкія (матроскія) і сяржанцкія; афіцэрскія; генеральскія (адміральскія) і маршальскія.

ЗВА́ННІ ВУЧО́НЫЯ, гл. *Ступені і званні вучоныя.*

ЗВА́ННІ ГАНАРО́ВЫЯ, у СССР адна з формаў узнагароды, прызнання заслуг і заахвочвання выдатных дзеячаў працы, навукі, мастацтва, ваен. справы. Падзяляюцца на саюзныя і рэспубліканскія. Устанаўленне, прысваенне і пазбаўленне саюзных З. г. адносіцца да кампетэнцыі Прэзідыума Вярх. Савета СССР, рэспубліканскіх — да кампетэнцыі Прэзідыума Вярх. Савета саюзнай рэспублікі. Асобам, якім прысвойваецца З. г., уручаюцца пасведчанне і нагрудны знак.

Вышэйшыя З. г. ў СССР: *Герой Савецкага Саюза* (1934), *Герой Сацыялістычнай Працы* (1938). З. г. саюзныя: *народны артыст СССР* (1936), *народны мастак СССР* (1943), *народны архітэктар СССР* (1957), *маці-гераіня* (1944); засл. лётчык-выпрабавальнік СССР (1958), засл. штурман-выпрабавальнік СССР (1958), лётчык-касманаўт СССР (1961), засл. ваенны лётчык СССР (1965), засл. ваен. штурман СССР (1965), засл. пілот СССР (1965), засл. штурман СССР (1965).

Ганаровыя званні, устаноўленыя ў БССР (гл. таксама адпаведныя арт. са спісамі ўзнаг. асоб): народны артыст Беларускай ССР (1927), народны мастак Беларускай ССР (1944), народны паэт Беларускай ССР (1956), народны пісьменнік Беларускай ССР (1956), заслужаны аграном Беларускай ССР (1953), заслужаны артыст Беларускай ССР (1928), заслужаны архітэктар Беларускай ССР (1968), заслужаны будаўнік Беларускай ССР (1960), заслужаны ветэрынарны ўрач Беларускай ССР (1949), заслужаны вынаходнік Беларускай ССР (1959), заслужаны геолаг-разведчык Беларускай ССР (1968), заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1957), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР (1940), заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1940), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларускай ССР (1940), заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларускай ССР (1967), заслужаны заатэхнік Беларускай ССР (1949), заслужаны землеўпарадчык Беларускай ССР (1968), заслужаны лесавод Беларускай ССР (1963), заслужаны майстар прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР (1956), заслужаны меліяратар Беларускай ССР (1963), заслужаны механізатар с. гасп. Беларускай ССР (1961), заслужаны настаўнік Беларускай ССР (1940), заслужаны настаўнік прафесійна-тэхнічнай адукацыі Беларускай ССР (1956), заслужаны работнік бытавога абслугоўвання насельніцтва Беларускай ССР (1970), заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання Беларускай ССР (1966), заслужаны рацыяналізатар Беларускай ССР (1959), заслужаны сувязіст Беларускай ССР (1965), заслужаны ўрач Беларускай ССР (1940), заслужаны шафёр Беларускай ССР (1968), заслужаны эканаміст Беларускай ССР (1970), заслужаны энергетык Беларускай ССР (1970), заслужаны юрыст Беларускай ССР (1966).

Апрача саюзных і рэсп. З. г., уведзены ганаровыя званні ў асобных галінах нар. гасп. (ганаровы гарняк, ганаровы металург, ганаровы шахцёр, ганаровы радыст, лепшая даярка рэспублікі, лепшы свінавод Беларусі і інш.). Права прысвойваць З. г. даецца таксама прадпрыемствам (ганаровае званне прадпрыемства), калгасам (засл. калгаснік, майстар жывёлагадоўлі, майстар раслінаводства і інш.). Для мастацкіх калектываў устаноўлены З. г.: нар. тэатр, нар. хор, засл. капэла, засл. аркестр, засл. хор. З. г. надаюцца спартсменам за высокае спарт. майстэрства (гл. *Званні спартыўныя*). Гар. Саветы дэпутатаў працоўных прысвойваюць званне ганаровага грамадзяніна горада.

ЗВА́ННІ СПАРТЫЎНЫЯ, прысвойваюцца за выдатныя спартыўныя дасягненні, поспехі ў выхаванні спартсменаў высокага класа і актыўную грамадска-педагагічную дзейнасць. З. с. ў СССР: майстар спорту СССР (вышэйшы спарт. разрад), уведзена пастановай Вышэйшага савета фіз. культуры пры ЦВК СССР у 1935; засл. майстар спорту СССР, уведзена ў 1934, прысвойваецца за выдатныя спарт. дасягненні; гросмайстар СССР — вышэйшае шахматна-спартыўнае званне, уведзена ў 1935. Міжнар. шахматная федэрацыя ў 1949 устанавіла званні міжнар. майстар і міжнар. гросмайстар. Званне засл. трэнер СССР уведзена Камітэтам па фіз. культуры і спорце пры Савеце Міністраў СССР у 1956, прысвойваецца за поспехі ў выхаванні майстроў спорту, чэмпіёнаў і рэкардсменаў краіны, Еўропы і свету. З. с. прысвойваюцца Камітэтам па фіз. культуры і спорце пры Савеце Міністраў СССР. Званне суддзі па спорце (першай, рэспубліканскай, усесаюзнай катэгорыі, ганаровы) прысвойваецца асобам, якія маюць практыку судзейства спарт. спаборніцтваў і закончылі спецыяльныя семінары.

У БССР устаноўлены З. с.: *заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларускай ССР* (1967); засл. трэнер БССР, уведзена Камітэтам па фіз. культуры і спорце пры Савеце Міністраў БССР у 1959 і прысвойваецца за поспехі ў выхаванні спартсменаў высокага класа.

К. А. Кулінковіч. Мінск.

ЗВАНО́ЧАК, кампанула (Campanula), род адна-, двух- і шматгадовых травяністых раслін, зрэдку паўкустоў сям. званочкавых. Вядома больш за 300 відаў, пашыраных пераважна ва ўмеранай зоне Паўн. паўшар'я. У СССР 154 віды, на Беларусі 11.



Званочак круглалісты.

Лісце цэласнае, часам знізу сцябла ў разетцы. Кветкі яркалавандавыя, званочкападобныя, звычайна блакітныя і сінія, сабраныя ў галоўкі, гронкі, мяцёлкі. Плод — каробачка. Растуць З. ў лясах, на лугах, некат. вырошчваюцца як дэкаратыўныя (З. скучаны, З. сярэдні, З. шыракалісты, З. персікалісты). Спрод З. ёсць ядомыя (З. рапчаты, З. крапівалісты) і лекавыя віды (З. круглалісты, З. раскідзісты).

Літ.: Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

ЗВАНЫ́, 1) ударныя сігнальныя інструменты, звычайна з бронзы ці сталі, у выглядзе пустой, адкрытай знізу грушы; у тэхніцы — умоўная назва прадметаў, па форме падобных да З. 2) У музыцы — ударны музычны інструмент; набор храматычна настроеных латуневых трубак (12—18), умацаваных на металічнай або драўлянай рамастойцы. Інструментам карыстаюцца ў сімф. і оперных аркестрах для імітацыі гуку званоў.

ЗВА́РКА, спосаб нераздымнага злучэння цвёрдых целаў сіламі атамна-малекулярнага счаплення пры расплаўленні або ўзаемным дэфармаванні матэрыялаў. Вызначаецца прадукцыйнасцю, універсальнасцю і эканамічнасцю. Пашырана ў металаапр. прамысловасці, будаўніцтве і машынабудаванні (гл. *Зварныя канструкцыі*). Найб. значэнне мае З. металаў. Зварваюць таксама пластмасу, шкло, кераміку і інш.

З. ажыццяўляецца двума асн. спосабамі: награваннем і пластычным дэфармаваннем (або тым і другім адначасова). Звычайна матэрыял у месцы злучэння плавіцца, утвараючы пасля астывання зварное шво. З. плаўленнем па спосабе нагрэву

падзяляецца на *дугавую электразварку* (яе разнавіднасць — *газаэлектрычная зварка*), *электрашлакавую зварку, газавую зварку* і *тэрмітную зварку*. Найлепш паддаюцца аўтаматызацыі дугавая З. пад флюсам (гл. *Аўтаматычная зварка*) і электрашлакавая. З. пластычнай дэфармацыяй (інакш — З. ціскам) робіцца без расплаўлення матэрыялаў з выкарыстаннем нагрэву або без яго. Можа ажыццяўляцца ў вакууме. Па спосабе награвання падзяляецца на горнавую (*кавальская зварка*), пры якой метал награецца ў горнах або печах; газапрэсавую з награваннем металу полымем газаў, якія спальваюцца з дапамогай зварачных гарэлак; *кантактавую зварку* з электранагрэвам. З. ціскам ужываецца для злучэння дэталяў з розных металаў, у тым ліку каляровых і спец. сплаваў. Па металург. сродках аховы і легіравання зварнога шва адрозніваюць З. ў асяроддзі аховнага газу, З. пад флюсам, З. электродамі з газашлакаўтваральнымі пакрыццямі; па тыпе электродаў — З. плаўкімі і няплаўкімі (вугальнымі, вальфрамавымі і інш.) электродамі; па газах, якія выкарыстоўваюцца,— ацэтылена-кіслародную (аўтагенную), вадародна-кіслародную і інш. Пашыраюцца новыя віды З.: *зварка трэннем*, ультрагукавая, З. ў вакууме ціскам, электронным промнем і інш.

Літ.: Багрянский К. В., Добротина З. А. и Хренов К. К. Теория сварочных процессов, Харьков, 1968; Баранов И. Б. Холодная сварка пластичных металлов, 3 изд., Л., 1969; Назаренко О. К., Истомин Е. И. и Локшин В. Е. Электронно-лучевая сварка, М., 1966; Справочник электросварщика, 3 изд., М.— Киев, 1961; Силин Л. Л., Баландин Г. Ф. и Коган М. Г. Ультразвуковая сварка, М., 1962; Березин А. Ф. Сварка и резка взрывом, М., 1965; Сагалович Д. Н. История развития и современные методы сварки в СССР, в. 1, Л., 1954; гл. таксама пры адпаведных артыкулах.

ЗВА́РКА ТРЭ́ННЕМ, адзін з відаў зваркі металаў пластычнай дэфармацыяй, пры якой награванне паверхняў звар'вання робіцца ўзаемным трэннем вырабаў пад ціскам (гл. рыс.). Вызначаецца высокай прадукцыйнасцю, малым спажываннем энергіі, высокай якасцю зварнога злучэння, прастатой абсталявання.



Схема зваркі трэннем: *1*, *2* — дэталі, якія звараюцца; *3* — паверхня трэння і зваркі; *v* — скорасць; *p* — намаганне.

Дае магчымасць зварваць металы, якія рэзка адрозніваюцца сваімі цеплафізічнымі ўласцівасцямі (напр., сталь з алюмініем і меддзю, тытан з алюмініем і інш.). Дыяпазон сячэнняў, якія метадагодна зварваць трэннем,— ад 30 да 8000 *мм*². Машыны для З. т. уключаюцца ў паточныя лініі мех. апрацоўкі. Пашырана ў машынабудаўнічай і інструментальнай вытворчасці. У БССР З. т. укаранёна на Мінскім трактарным з-дзе (МТЗ), выкарыстоўваецца на Віцебскім з-дзе запасных частак, Мінскім інструментальным з-дзе і інш. Абсталяванне для З. т. выпускае МТЗ (машыны тыпу СМСТ) і Ваўкавыскі з-д ліцейнага абсталявання (машыны тыпу МСТ).

Літ.: Вавилов А. Ф. и Воинов В. П. Сварка трением, М., 1964; Аверин И. В. и Кабанов Н. Н. Сварка трением в инструментальном производстве, М.— Л., 1962.

ЗВАРНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ, металічныя канструкцыі будынкаў, прамысл., гідратэхнічных і інш. збудаванняў, элементы якіх злучаны *зваркай*.

Каля 95% усіх стальных канструкцый зварныя. Перавагі перад клёпанымі: эканомія металу на 10—12%; больш нізкі кошт работ; герметычнасць швоў, што асабліва важна для рэзервуараў, трубаправодаў і інш. Недахопы З. к.— наяўнасць унутр. напружанняў і дэфармацый, карабачанне тонкіх элементаў. Для З. к. выкарыстоўваюць пераважна т. зв. спакойныя і паўспакойныя сталі (нізкалегіраваныя сталі марак 10Г2С, 14Г2, 15ГС, 15ХСНД і інш.). З. к. робяць пераважна *дугавой зваркай*, элементы значнай таўшчыні (30—50 мм і больш) — *электрашлакавай зваркай*.

Літ.: Патон Е. О. Избранные труды, т. 2— Сварные конструкции, Киев, 1961; Николаев Г. А. Сварные конструкции, 3 изд., М., 1962; Баранов М. С. Технология производства сварных конструкций, М., 1966; Бондин И. Н. Контроль качества сварных соединений и конструкций, М.— Л., 1962.

ЗВАРО́Т МЕТАЛА́Ў, тое, што *адпачын металаў*.

ЗВАРО́ТАК, слова або спалучэнне слоў, што называюць асобу ці прадмет, да якіх звяртаюцца з мовай. У бел. мове выражаецца назоўным скл. назоўніка ці інш. часцінай мовы («Даруйце, любыя! Даруй, матуля!»), а таксама клічнай формай («Не шукай сабе, мой братку, з ветрам Бацькаўшчыну-матку»).

Сінтаксічна З. са сказам не звязаны і членам сказа не бывае. Можа стаяць у пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа. Каб узмацніць эмацыянальнасць, З. суправаджаюць выклічнікамі і інш. словамі суб'ектыўнай ацэнкі («О край мой любимый, як многа прыволля, і думам і працы бяскрайні прастор»).

Літ.: Граматыка беларускай мовы, т. 2 — Сінтаксіс, Мн., 1966. *А. Я. Баханькоў.*

ЗВАРО́ТНЫ ТЫФ, вострая інфекцыйная хвароба з групы *тыфаў*, якая выклікаецца спірахетамі і перадаецца насякомымі-крыважмокамі (вашамі) і кляшчамі. Адрозніваюць вашывы і кляшчовы З. т. Найчасцей бывае (асабліва ў час войнаў) эпідэмічны (еўрапейскі, вашывы). Узбуджальнік яго — спірахета, адкрытая ням. урачом О. Обермеерам у 1868. Інкубацыйны перыяд 7—10 дзён. Прыкметы: чаргуюцца прыступы азнобу, т-ры да 41 °С, болю ў крыжы, мышцах, суставах (4—7 дзён) з перыядамі (7—15 дзён) без хваробы. Ускладненні: крывацёк, інфаркт або разрыў селязёнкі, калапс, міякардыдыстрафія. Лячэнне: пеніцылін, біяміцын, сальварсан, наварсенол, сардэчныя сродкі. Прафілактыка: ізаляцыя хворых, барацьба з вашывасцю. Эпідэмічны З. т. у СССР і БССР ліквідаваны ў 40-я г. 20 ст.

Літ.: Руководство по инфекционным болезням, М., 1962; Эпидемиология, 2 изд., М., 1963.
Дз. В. Палешка. Мінск.

ЗВАРТНО́Ц, выдатны помнік армянскай архітэктуры. Пабудаваны ў 641—661 каля г. Эчміядзіна (Арм. ССР).

Раскопкі руін вяліся ў 1901—07. Паводле рэканструкцыі (макет) Т. Тараманяна, З.— круглы, цэнтральнакупальны, 3-ярусны храм, у плане тэтраконх (4-апсідны). Усярэдзіне меў унутраную 2-павярховую галерэю, куды выходзілі апсіды, тры з якіх былі прарэзаны каланадамі (па 6 калон у кожнай). Выключным багаццем вызначалася дэкар. ўбранне інтэр'ераў (насценны роспіс, мазаіка) і фасадаў (разьбяны каменны арнамент і рэльефы — партрэты будаўнікоў храма).

ЗВАРЫКІНА Кіра Аляксееўна (н. 29.9.1919, Мікалаеў), беларуская савецкая шахматыстка. Засл. майстар спорту СССР (1957), міжнар. майстар (1952). Чэмпіёнка СССР (1951, 1953, 1956). Удзельніца турніраў прэтэндэнтак на матч з чэмпіёнкай свету (1952, 1955, 1959, 1961, 1964), пераможца аднаго з такіх турніраў (1959). Чэмпіёнка свету ў камандным заліку (1957, 1963). Чэмпіёнка БССР (1970). У 1968—70 узначальвала шахматную федэрацыю БССР. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Літ.: Быкова Е. Советские шахматистки, 2 изд., М., 1957, с. 131—132. *Я. Я. Камянецкі.* Мінск.

«ЗВЕЗДА МОЛОДЁЖИ», камсамольска-маладзёжнае выданне, якое выходзіла як старонка газ. *«Звязда»* з сак. 1920 у Смаленску на рус. мове ў час акупацыі Беларусі бурж. Польшчай. Заклікала моладзь Беларусі на барацьбу з акупантамі. Пасля вызвалення Беларусі ад інтэрвентаў выданне «З. м.» аднаўлена ў Мінску. Газ. «Звезда» з кастр. 1920 да студз. 1922 выпускала штотыднёвую маладзёжную старонку пад назвай «Звезда молодежи» як орган ЦК КСМБ і Мінскага пав. і гар. к-та КСМБ (для выдання «З. м.» была створана спец. рэдакцыя). Асвятляла жыццё моладзі, яе ўдзел у аднаўленні нар. гасп. рэспублікі.

Літ.: Булацкий Г. В. Из истории молодежной печати Белоруссии, у кн.: Из истории партийно-советской печати Белоруссии, Мн., 1960.

ЗВЕЗДАРЫ, група вясковай моладзі, якая па старадаўнім звычаі ў час зімовых калядных свят (гл. *Каляды*) з песнямі, скокамі, гульнямі хадзіла са *звяздой* ад хаты да хаты. Нашэнне звязды суправаджалася каляданнем, шчадраваннем, паказам «казы», «мядзведзя», «жорава», «кабылкі», «цыганоў», батлейкі, скамарохаў.

ЗВЕЗДАЧО́ТАЎ Мікалай Пятровіч [н. 14(27).11.1904, Пенза], беларускі савецкі акцёр. Нар. арт. БССР (1944). Чл. КПСС з 1946. Пасля заканчэння Ленінградскага тэатр. тэхнікума (1929) працуе ў т-ры імя Я. Коласа. Акцёр яркага тэмпераменту. Паказваючы духоўнае жыццё герояў, стварае рамантызаваныя вобразы. Найб. удалыя ролі валявых, моцных духам людзей. У сав. п'есах: Гуліп («Байцы» Б. Рамашова), Коткін («Любоў Яравая» К. Транёва), Бярсеневў («Разлом» Б. Лаўрэнёва), Шадрын («Чалавек з ружжом» М. Пагодзіна), Глоба («Рускія людзі» К. Сіманава), Бяссмертны («Праўда і крыўда» паводле М. Стэльмаха). З класічнага рэпертуару: Нешчасліўцаў («Лес» А. Астроўскага), Булычоў, Сацін, Лёўшын, Цецераў («Ягор Булычоў і іншыя», «На дне», «Ворагі», «Мяшчане» М. Горкага), Клаўдзій («Гамлет» У. Шэкспіра), Шрусберы («Марыя Сцюарт» Ф. Шылера). Камед. ролі: Гарадничы («Рэвізор» М. Гогаля), Кураслепаў («Гарачае сэрца» Астроўскага), Раманюк («Калінавы гай» А. Карнейчука) і інш. Вылучаюцца ролі ў бел. драматургіі: Алесь («Вайна вайне» Я. Коласа), Арджанікідзе («Над Бярозай-ракой» П. Глебкі), Чарнуха («Песня нашых сэрцаў» В. Палескага), Невядомы («Раскіданае гняздо» Я. Купалы), Калібераў («Выбачайце, калі ласка!» А. Макаёнка), Скробат («Людзі і д'яблы» К. Крапівы), Томаш («Лявоніха» П. Данілава). Узнаг. 3 ордэнамі, медалямі.




М. П. Звездачотаў у ролі Ягора Булычова (сцэна са спектакля).

Літ.: Маўзон А., Н. П. Звездачотаў, у кн.: Мастацтва Савецкай Беларусі, Мн., 1955; Скібнеўскі А. Майстар сцэнічнага вобраза, у кн.: Майстры беларускай сцэны, Мн., 1960.
А. В. Сабалеўскі. Мінск.

«ЗВЁНЬЯ», аб'яднанне рускіх пісьменнікаў і паэтаў, утворанае ў ліст. 1925 у Мінску. Выдала альманах «Звенья» (1926). Члены аб'яднання перакладалі на рус. мову творы бел. пісьменнікаў. У 1928 «З.» ўвайшлі ў БелАПП як рус. секцыя.

Літ.: Садовский Е. Нас было тринадцать, «Неман», 1965, № 2.

ЗВЕРАГАДОЎЛЯ, галіна жывёлагадоўлі, развядзенне звяроў на пушніну.

Прамысловая З. ў СССР пачала развівацца з 1927. Невялікія маладаходныя фермы ператварыліся ў буйныя спецыялізаваныя гасп., аснашчаныя перадавой тэхнікай. Яны карыстаюцца навук. звесткамі пра кармленне, гадоўлю і догляд звяроў. Пушная прадукцыя ідзе на ўнутраны і знешні рынкі. Па колькасці яе, атрыманай ад З., СССР займае 2-е месца ў свеце (з 1965). З. развіваецца ў ЗША, Канадзе, Даніі, Фінляндыі, Швецыі.

Першая вялікая звераферма гасп. на Беларусі — звераферма «Беларускі» (Вілейскі р-н). У БССР 5 звераферм, 10 каап. звераферм, 5 калгасных фермаў (1971). Гал. кірунак у бел. З.— гадоўля норак: карычневых (пастальных, тапазавых, жамчужных і інш.), блакітных і белых. Гадуюць серабрыста-чорных лісоў, нарвежскіх пясцоў. Племянны статак звяроў у гасп. усіх катэгорый (82 тыс. галоў, 1.1.1970) павялічыўся ў 13 разоў у параўнанні з 1960. У аматарскіх гасп.

Шэд для норак. Маладзечанская звераферма.



разводзяць путрыяў. Селекцыйная работа ў З. накіравана на паляпшэнне якасці апушэння, колеру і структуры футра (гушчыня, даўжыня, мяккасць), павышэнне плоднасці і жыццяздольнасці звяроў, гадоўлю ў няволі новых відаў (собаль, бабёр, шыншыла). Пушніна зверагаспадарак Беларусі высакаякасная і карыстаецца вялікім попытам. Уд. вага пушніны, якую дае клеткавая З. (у вартасным выражэнні), складае 98% усяго аб'ёму нарыхтовак пушніны ў рэспубліцы. Навук. работа па З. вядзецца ў Бел. аддзяленні Усесаюзнага НДІ паляўнічай гасп. і зверагадоўлі Цэнтрасаюза.

Літ.: Афанасьев В. А. и Перельдик Н. Ш. Клеточное пушное звероводство, М., 1966; Ильина Е. Д. и Кузнецов Г. А. Генетические основы разведения цветных пород, М., 1965; Румянская Е. И. Пути развития и повышения рентабельности зверохозяйств потребительской кооперации БССР, у кн.: Материалы научной конференции Всесоюзного научно-исследовательского ин-та животного сырья и пушнины Центросоюза, М., 1964; Палкин Г. А., Зотова В. С. и Васильков В. В. Состояние и перспективы развития звероводства в Белоруссии, «Кролиководство и звероводство», 1962, № 6; Зотова В. С. и Васильков В. В. Звероводческий совхоз Белоруссии, «Кролиководство и звероводство», 1962, № 7. *Я. І. Румінская.* Мінск.

ЗВЕРАЎ Аляксей Васілевіч [н. 5(18).3.1911, в. Ольша Аршанскага пав. Магілёўскай губ.], наватар вытворчасці, Герой Сац. Працы (1966). Чл. КПСС з 1949. Удзельнік Айч. вайны. Прац. дзейнасць пачаў у 1928 на ст. Орша. З 1930 на БелДРЭС; рознарабочы, электраманцёр, брыгадзір рамонтнай брыгады. З 1944 майстар Аршанскага прадпрыемства электрасетак Віцебскэнерга. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі.

ЗВЕРАЎ Анатоль Міхайлавіч (27.4.1925, в. Бахтэмір Іканінскага р-на Ніжняволжскага краю — 26.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. ВЛКСМ. У Чырв. Арміі з 1943. Вызначыўся ў Віцебскай вобл. 26.6.1944 з групай байцоў пад агнём праціўніка фарсіраваў Зах. Дзвіну каля в. Ерашова Бешанковіцкага р-на. Загінуў у баі за плацдарм. Яго імем названы школа і саўгас на радзіме.

ЗВЕРАЎ Мікалай Аляксандравіч (н. 19.12. 1921, Акмолінск), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. У ноч на 29.9.1943 узвод на чале з З. пад варожым агнём фарсіраваў Дняпро, замацаваўся на плацдарме і адбіў 3 контратакі. Паранены не пакінуў поля бою.

ЗВІНАГРОДСКІ Барыс Фёдаравіч [н. 1(13). 3.1896, г. Артвін Кутаіскай губ.], беларускі савецкі жывапісец. Засл. дзеяч маст. БССР (1956). Вучыўся ў Маск. вучылішчы жывапісу, ваяння і дойлідства (1917—18) у А. Архіпава. У 1918—19 у Чырв. Арміі. З 1925 у Гомелі. Гал. мастак Т-ра лялек БССР (1938—41, 1944—48). Супрацоўнічаў у перыяд. выданні «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941). Працуе ў станковым жывапісе (пейзаж і нацюрморт). Сярод пейзажаў, дзе паказаны куты Гомельшчыны: «Раніца на Сажы» (1945), «Каля прыстані» (1947), «Баржы на Сажы», «Адноўлены мост» (абодва 1949), «Сож каля суднарамонтнага завода» (1951), «Земснарад на Сажы» (1952), «Сож. Вялікая вада» (1953), «Вярхоўе ракі Сож» (1954), «Сож. Лёд праходзіць» (1960), «Зіма» (1962), «Прыцемкі на Прыпяці» (1963), «Мірнае неба» (1964), «Зеляніна. Май» (1967). У Дзярж. маст. музеі БССР 11 работ мастака.



Б. Ф. Звінагродскі. Сож. Вялікая вада. 1953. Дзярж. маст. музей БССР.

Літ.: Орлова М. А. Искусство Советской Белоруссии, М., 1960. *С. І. Кіганіна.* Мінск.

«ЗВОН» («Zwon»), контррэвалюцыйная газета, орган Рады *Беларускай народнай рэспублікі*, якая выдавалася ў Мінску беларускімі бурж. нацыяналістамі ў 1919 у час акупацыі Беларусі бурж. Польшчай. Выходзіла 3 разы на тыдзень на бел. мове, друкавалася лацінкай. Варожа ставілася да Сав. Расіі, Сав. Беларусі; дамагалася ўключэння Беларусі ў склад Польшчы. *С. В. Говін.* Мінск.

ЗВОНАК Алесь [Пётр Барысавіч; н. 1(14).2. 1907, Мінск], беларускі савецкі паэт. З рабочых. Скончыў БДУ (1931), аспірантуру пры Акадэміі мастацтвазнаўства (1934, Ленінград). Выхоўваўся ў дзіцячым доме. У 1925—27 працаваў адказным сакратаром газ. «Чырвоная Полаччына», узначальваў полацкую філію «Маладняка». З 1934 працаваў у АН БССР, у рэдакцыі газ. «Літаратура і мастацтва». Друкуецца з 1925. Першы зб. вершаў «Пунсовае ранне» (1926, з Я. Бобрыкам і Я. Туміловічам). Бадзёры настрой, атмасфера ўзрушанасці, пафас жыццесцвярджэння ўласцівыя ранняй лірыцы З. (зб. «Буры ў грыпіце», 1929; «На лінію агню!», 1932; «Мая Радзіма», 1935). Аўтар паэм «Каршун» (1930), «Загай» (1931). У 30-я г. напісаў манаграфіі пра тэатр У. Меерхольда і тэатр У. Галубка (рукапісы загінулі), шэраг артыкулаў пра тэатр і драматургію. У зб. «Табе адной» (1957), «Запаветнае» (1961) — схільнасць да філас. роздуму над жыццём і часам, павышаная зацікаўленасць маральна-этычнымі пра-



блемамі. Выступае і як крытык, драматург (п'еса «Навальніца будзе», 1960, па матывах трылогіі Я. Коласа «На ростанях»; паст. т-рам імя Я. Коласа, 1959), перакладчык («Апошні з удэге» А. Фадзеева, 1935, з М. Хведаровічам; апавяданні А. Чэхава; «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш. Руставелі, 1966, з Хведаровічам; вершы М. Свяцілова, У. Лугаўскога, А. Пракоф'ева, М. Галоднага, Т. Масэнкі, У. Сасюры).

Тв.: Россыпь, Мн., 1967; Аўтабіяграфічныя нататкі, у кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі, Мн., 1963.
Літ.: Няхай Р. Лірыка Алеся Звонака, «Полымя», 1957, № 2; Хведаровіч М. Паэт у дарозе, «Полымя», 1967, № 2; Гаврук Ю. Душы певучая веснянка, «Неман», 1968, № 11. *М. Р. Ярош.* Мінск.

ЗВОНЬ (Званское), возера ў бас. Ушачы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Ушацкім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,48 *км²*. Даўж. 2,1 *км*, найб. шыр. 1,2 *км*, сярэдняя 0,7 *км*. Катлавіна круглявая. Схілы пераважна спадзістыя, толькі на ПнУ ўмерана стромкія. З а-вы. Вадазбор (24 *км²*) слабаўзгорысты, складзены з марэны. Праточнае: з Пд упадае Званіца, сцёк праз пратоку ў воз. Вялікае Існа. Водзяцца лешч, плотка, шчупак, язь, карась, лінь, акунь.

ЗВЫЧАЁВАЕ ПРАВА, сукупнасць санкцыянаваных дзяржавай пяпісаных нормаў і правілаў паводзін людзей у грамадстве. Склалася разам з узнікненнем дзяржавы. Панаючыя класы санкцыянавалі звычаі, якія адпавядалі іх інтарэсам.

З узмацненнем дзярж. улады З. п. замацоўвалася ў пісьмовых актах, статутах, граматах, зборніках (*«Руская праўда», Дагавор 1229, Судзебнікі*). З развіццём бурж. грамадства З. п. замяняліся пісаным правам. На Беларусі З. п. пашырана да 16 ст. (асабліва шырока ўжывалася ў *копных судах*). У некат. краінах нормы З. п. дзейнічаюць і цяпер. У сав. праве яны амаль адсутнічаюць і не маюць практ. значэння.

Літ.: Дювнар-Запольский М. В. Очерки семейного обычного права крестьян Минской губернии, у яго кн.: Исследования и статьи, т. 1, Киев, 1909; Дьяконов М. Очерки общественного и государственного строя Древней Руси, 3 изд., СПб., 1910. *І. А. Юхо.* Мінск.

ЗВЫЧАЙ, правіла, якое ўсталявалася ў выніку асаблівасцей гістар. развіцця народа, нацыі, класа, групы людзей і выконваецца імі па традыцыі; рэгулюе паводзіны людзей у пэўнай галіне грамадскага жыцця. З., санкцыянаваныя дзяржавай, робяцца нормамі *звычаёвага права*. У сацыяліст. грамадстве пераадольваюцца шкодныя, адсталыя З. і складваюцца новыя, прагрэсіўныя. З., якія адпавядаюць патрабаванням сав. права і камуніст. маралі, становяцца правіламі сацыяліст. супольнага жыцця.

ЗВЫШВЫСОКАЧАСТОТНАЯ ТЭХНІКА, галіна тэхнікі, што распрацоўвае і эксплуатуе прылады і апаратуру, у якіх выкарыстоўваюцца электрамагнітныя хвалі частатой ад 30 *Мгц* да 3000 *Ггц*. Шырока выкарыстоўваецца ў даследаваннях касм. прасторы, фізіцы элементарных часцінак і ядз. фізіцы, хіміі (сінтэз рэчываў і паскарэнне хім. рэакцый), медыцыне (звышвысокачастотная тэрапія і дыягностыка хвароб), прамысловасці (неразбуральныя метады кантролю, апрацоўка драўніны, зварка пластмас, сушка мясапрадуктаў, збожжа, бульбы і інш.).

Хвалі звышвысокачастотныя (ЗВЧ) па характары распаўсюджвання набліжаюцца да святловых, што дае магчымасць выкарыстоўваць іх для накіраванай перадачы сігналаў. У дыяпазоне ЗВЧ праводнасць іанасферы выяўляецца вельмі слаба, хвалі амаль што без перашкод пранікаюць праз атмасферу і іанізаваныя слаі, якія акружаюць Зямлю, гэта робіць магчымым даследаваць касм. прастору з дапамогай радыёвыпрамянення Сонца, зорак і інш. касм. целаў. Перыяд ЗВЧ ваганняў сувымерны з часам пралёту электронаў у міжэлектроднай прасторы электравакуумных прылад, што не дае магчымасці ўжываць у З. т. звычайныя электравакуумныя прылады. Выкарыстоўваюцца спец. тыпы прылад — *клістроны, магнетроны, лямпы бягучай хвалі* і інш., а таксама паўправадніковыя ЗВЧ прылады — тунельныя, лавінапралётныя дыёды і інш. У ЗВЧ дыяпазоне можна размясціць значна большую колькасць каналаў сувязі, чым на нізкіх частотах. Вял. інфармацыйная ёмістасць ЗВЧ дыяпазона дазваляе ажыццяўляць шматканальную тэлеф. і тэлевізійную сувязь. У З. т. пашыраны спец. лініі перадачы: прамавугольныя, круглыя, палоскавыя *хвалеводы*; як вагальныя сістэмы выкарыстоўваюцца *рэзанатары*.

Літ.: Лебедев И. В. Техника и приборы СВЧ, т. 1, 2 изд., М., 1970; Ковалев И. С. Теория и расчет полосковых волноводов, Мн., 1967; Альтман Дж. Л. Устройства сверхвысоких частот, пер. с англ., М., 1968; Харвей А. Ф. Техника сверхвысоких частот, пер. с англ., т. 1—2, М., 1965. *І. С. Кавалёў.* Мінск.

ЗВЫШГАЛАКТЫКА (звышскопішчагалактык), сукупнасць зорных сістэм, якая налічвае да 10 тыс. вялікіх і яшчэ больш карлікавых галактык і мае працягласць да 50 *Мпс*. Членамі З. з'яўляюцца як асобныя галактыкі, так і невялікія групы іх, а таксама буйныя скопішчы галактык.

Мясцовая група галактык (наша *Галактыка, Магеланавы Воблакі*, галактыка ў *Андрамедзе* з ле спадарожнікамі, галактыка ў *Трыкутніку*, найбліжэйшыя іншыя) і амаль усе галактыкі, бачныя як аб'екты да 13-й зорнай велічыні, уваходзяць у Мясцовую З. Цэнтральнае згушчэнне Мясцовай З.— буйное скопішча галактык у сузор'і Дзевы (да 500 вялікіх галактык). Наша Галактыка знаходзіцца на адлегласці 14 *Мпс* ад яго, г. зн. бліжэй да перыферыі З., таму галактыкі, што нас акружаюць, утвараюць на нябеснай сферы шырокі пояс («Млечны Шлях галактык»), амаль перпендыкулярны да зорнага Млечнага Шляху. Выяўлены слады ўнутраных рухаў у З.: павольнае вярчэнне вакол цэнтральнага згушчэння з расшырэннем. У сузор'ях Льва і Геркулеса знаходзяцца іншыя з больш бліскіх З.

Выяўлена пакуль каля 50 звышскопішчаў галактык, таму мяркуюць, што ў *Метагалактыцы* тыповымі з'яўляюцца не З., а скопішчы галактык, якія маюць значна меншыя памеры.

Літ.: Агекян Т. А. Звезды, галактики, Метагалактика, 2 изд., М., 1970. *Ю. П. Пскоўскі.* Масква.

ЗВЫШНОВЫЯ ЗО́РКІ, зоркі, якія характарызуюцца гіганцкімі ўспышкамі — скачкападобным павелічэннем бляску ў сотні мільёнаў разоў. Пры ўспышцы З. з. яркасць яе за 10—20 сутак робіцца параўнальнай з сумарнай яркасцю ўсёй зорнай сістэмы — галактыкі, унутры якой знаходзіцца гэтая З. з. У звычайнай галактыцы ўспышка З. з. бывае ў сярэднім адзін раз за 400 гадоў. У нашай Галактыцы за апошнія 1000 гадоў назіраліся 3 такія ўспышкі. Па характары змены бляску і спектра З. з. падзяляюцца на 2 тыпы. У З. з. I тыпу павышэнне бляску пасля максімуму праходзіць роўна: ён памяншаецца ўдвая за кожныя 40—50 сутак; спектры іх складаюцца з вельмі шырокіх палос і пакуль

не расшыфраваны. З. з. II тыпу вызначаюцца вял. разнастайнасцю ў характары зніжэння бляску пасля максімуму; палосы ў спектрах такіх зорак ствараюцца выпрамяненнем атамаў H, He, N і інш. элементаў.

Пры ўспышцы ад З. з. адрываюцца знешнія слаі, утвараючы зорную абалонку, якая расшыраецца са скорасцю 6—8 тыс. *км/сек*. Масы абалонак З. з. парадку масы *Сонца*. Хуткае нарастанне бляску пры ўспышцы выклікана гал. ч. павелічэннем памераў абалонкі, якая выпрамяняе. Такая абалонка пры далейшым расшырэнні, праз сотні гадоў пасля ўспышкі, ператвараецца ў туманнасць вялікіх памераў. Туманнасці, ці астаткі ўспышак З. з.,— магутныя крыніцы выпрамянення ў радыёдыяпазоне. Выпрамяняюць электроны, што рухаюцца ў магн. полі са скорасцю, блізкай да скорасці святла. Вядома некалькі дзесяткаў астаткаў успышак З. з. у нашай Галактыцы. Пры ўспышцы З. з. ў 1054 параўнальна блізка ад Сонца ўтварылася т. зв. Крабападобная туманнасць у сузор'і Цяльца — вельмі магутная крыніца радыёхвалянў і рэнтгенаўскіх праменяў. У цэнтры яе знаходзіцца аб'ект асаблівай прыроды — *пульсар* — магчыма, астатак зоркі пасля ўспышкі.

Мяркуюць, што прычынай успышкі З. з. з'яўляецца выбух як вынік інтэнсіўных тэрмаядзерных рэакцый у зорцы на позняй стадыі яе эвалюцыі. На гэтай стадыі з ядраў атамаў вадароду і гелію ўжо ўтварыліся больш цяжкія элементы. Рэакцыі з удзелам такіх элементаў суправаджаюцца *калапсам* і вядуць да ўзнікнення моцнай ударнай хвалі. Хваля распаўсюджваецца па зорцы наверх і зрывае яе знешнія слаі, утвараючы зорную абалонку. Энергія выбуху 10^{43}—10^{45} *дж*. Такая колькасць энергіі выпрамяняецца Сонцам за мільярды гадоў. Пры ўспышцы З. з., акрамя бачнага, утвараюцца і іншыя віды выпрамянення, у прыватнасці касм. прамяні.

Літ.: Шкловский И. С. Сверхновые звезды, М., 1966; Горбацкий В. Г. Космические взрывы, М., 1967. *В. Г. Гарбацкі*. Ленінград.

ЗВЫШПРАВОДНАСЦЬ, з'ява практычна поўнага знікнення эл. супраціўлення (адпаведна павелічэнне праводнасці) металаў пры т-рах ніжэй за т. зв. крытычную тэмпературу. Адкрыта ў 1911 галандскім фізікам Г. Камерлінг-Онесам.

Крытычныя тэмпературы ($T_к$) металаў і сплаваў знаходзяцца ў вобласці ад велічыні менш за 1 К да ~ 21 К (напр., для Hf $T_к$=0,35 К, для сплаву $(Nb_3Al)_4Nb_3Ge$ $T_к$=20,6 К). Вынікам адсутнасці супраціўлення з'яўляецца існаванне незатухальных токаў: замкнёны ток, наведзены ў кольцы з звышправадніка, шмат гадоў не вылучае адзнак затухання. З. суправаджаецца ідэальным *дыямагнетызмам*: магн. поле не пранікае ў тоўшчу звышправадніка, калі напружанасць H поля не перавышае некат. крытычнага значэння $H_к$ (эфект Мейснера). Пры $H>H_к$ магнітнае поле пранікае ў тоўшчу звышправадніка, З. знікае і метал пераходзіць у нармальны стан. Прычына З.— змена энергетычнага спектра электронаў у металах у выніку ўтварэння звязаных пар электронаў. Пры ўзаемадзеянні з іонамі крышталічнай рашоткі металу электроны паляразуюць яе, г. зн. вакол электронаў узнікае эфектыўны дадатны эл. зарад, да якога прыцягваюцца другія электроны. Гэтае прыцягненне можа скампенсаваць іх адштурхоўванне як аднайменных эл. зарадаў. Т. ч. электроны ствараюць звязаныя пары (памерам каля 10^{-4} *см*). У звычайных умовах такія пары разрываюцца за кошт энергіі цеплавых ваганняў крышталічнай рашоткі, і метал знаходзіцца ў нармальным стане. Звычайна ў метале для пераводу электронаў з аднаго стану ў другі дастаткова даволі малых порцый энергіі, і таму на такі перавод часткова затрачваецца энергія ўсякага ўпарадкаванага руху электронаў (напр., эл. току), г. зн. ёсць супраціўленне эл. току. Пры т-рах, меншых за $T_к$, энергія цеплавых ваганняў рашоткі не хапае для разрыву створаных пар, і для пераводу электронаў з аднаго стану ў другі неабходны большыя порцыі энергіі. Таму спараныя электроны будуць рухацца ў металі без затрат энергіі, г. зн. у звышправадніку знікае эл. супраціўленне. Асаблівыя ўласцівасці звышправаднікоў знайшлі шырокае выкарыстанне ў шэрагу фіз. прылад — звышправодныя магніты, гальванометры, *балометры*, *тэрмометры* і інш.

Літ.: Боголюбов Н. Н., Толмачев В. В. и Ширков Д. В. Новый метод в теории сверхпроводимости, М., 1958; Бардин Дж. Успехи в изучении сверхпроводимости, «Успехи физических наук», 1970, т. 102, в. 2; Де Жен П. Сверхпроводимость металлов и сплавов, пер. с англ., М., 1968; Сверхпроводимость и ее применение в электротехнике, пер. [з англ.], М.— Л., 1964.

Л. І. Камароў. Мінск.

ЗВЫШТЭРМІНОВАЯ СЛУЖБА, добраахвотная служба ў арміі радавога і малодшага каманднага саставу пасля заканчэння тэрміну абавязковай вайсковай службы. Ва Узбр. Сілах СССР уведзена ў 1925.

ЗВЫШУРОЧНАЯ РАБОТА, работа, якая выконваецца паводле распараджэння адміністрацыі прадпрыемства (установы) звыш вызначанага рабочага часу. Звычайна не дапускаецца. У выключных выпадках можа быць толькі з дазволу ФЗМК.

Агульная колькасць З. р. для кожнага работніка за год не павінна перавышаць 120 гадзін, за 2 дні запар — 4 гадзіны. Ад З. р. вызваляюцца цяжарныя жанчыны (пасля 4 месяцаў цяжарнасці), маці з грудзімі дзецьмі, падлеткі да 18 гадоў, вучні школ рабочай моладзі, інваліды. Аплата за З. р. павышаная: за першыя 2 гадзіны — у паўтара разы, за наступныя — у 2 разы.

ЗВЫШЦЯКУЧАСЦЬ, комплекс фізічных з'яў у вадкім геліі пры т-рах, блізкіх да *абсалютнага нуля*. Атрымала назву ў сувязі з адкрытай у 1938 П. Л. *Капіцам* з'явай працякання вадкага гелію без трэння праз капіляры і вузкія шчыліны пры гэтай т-ры.

Пры т-ры 2,17 К (λ — пункт) у вадкім геліі (ізатоп ^{4}He) адбываецца фазавы пераход 2-га роду з нармальнага стану (гелій I) ён пераходзіць у звышцякучы стан (гелій II). З. суправаджаецца вельмі вял. цеплаправоднасцю і напружанасцю розніцы тэмператур у двух сасудах з звышцякучым геліем, злучаных капілярам, што вядзе да значнай рознасці ціску ў іх (тэрмамеханічны эфект). У звышцякучым геліі разам з звычайным гукам (ваганні ціску) існуе другі гук (ваганні т-ры). З.— квантавы эфект, які нельга растлумачыць на аснове класічных уяўленняў. Тэорыя З. ў ^{4}He створана сав. фізікам Л. Д. Ландаў. Яна заснавана на уяўленні пра характар элементарных узбуджэнняў квантавай вадкасці. У вадкім геліі змена энергіі суправаджаецца вылучэннем або паглынаннем гукавога кванта, які мае такую ж залежнасць паміж частатой і энергіяй, як і квант святла, але распаўсюджваецца са скорасцю гуку. Калі гелій II працякае праз капіляр са скорасцю, меншай за скорасць гуку, тады яго кінетычная энергія не пераходзіць у цеплавую, бо элементарныя ўзбуджэнні (гукавыя кванты) не могуць узнікнуць. Пры гэтым трэнне адсутнічае. Калі скорасць руху перавышае скорасць гуку, узнікае трэнне, З. знікае. Адкрыццё З. спрыяла ўзнікненню і развіццю новага раздзела сучаснай фізікі — квантавай гідрадынамікі.

Літ.: Капица П. Л. Вязкость жидкого гелия при температурах ниже точки λ, «Доклады АН СССР», 1938, т. 18, № 1; Ландау Л. Д. Собрание трудов, т. 1, М., 1969; Питаевский Л. П. Макроскопические квантовые явления, «Успехи физических наук», 1966, т. 90, в. 4; Квантовые жидкости. Теория. Эксперимент, М., 1969.

Л. І. Камароў. Мінск.

ЗВЯГІН Андрэй Рыгоравіч (н. 1902, в. Драчоўка Абаянскага пав. Курскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). На фронце з 1943. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. 15.10.1943 у складзе дэсантнай групы пераправіўся цераз Дняпро на Пд ад Лоева, першы ўварваўся ў варожыя траншэі, знішчыў мінамётны разлік, у рукапашнай сутычцы прарваўся праз 3 лініі абароны. З яго ўдзелам адбіта 3 контратакі праціўніка. Жыве на радзіме.

ЗВІЖДОЎСКІ Людвік Міхайлавіч [псеўд. Тапор; снеж. 1829, Вільня — 15(27).2.1864], удзельнік паўстання 1863 на Беларусі і ў Польшчы, рэвалюц. дэмакрат. З сям'і чыноўніка. Скончыў Акадэмію Ген. штаба (1859). З 1845 у арміі. З З. Серакоўскім і Я. Дамброўскім уваходзіў у склад кіраўніцтва польскай рэвалюц. арг-цыі ў Пецярбурзе. З 1860 у Вільні, намагаўся аб'яднаць рэвалюц. сілы Літвы і Беларусі, узначальваў *Літоўскі правінцыяльны камітэт*, меў уплыў на Камітэт рускіх афіцэраў у Польшчы. З крас. 1863 паўстанцкі ваен. начальнік Магілёўскага ваяводства, асабіста кіраваў аперацыяй па захопе ў ноч на 24.4.1863 г. Горак і далейшымі дзеяннямі горацкага паўстанцкага атрада. Але з-за неспрыяльных умоў для паўстання на Магілёўшчыне 30.4.1863 атрад распусціў і выехаў за мяжу. З пачатку 1864 паўстанцкі ваен. начальнік Сандамірскага ваяводства і камандзір Кракаўскай дывізіі. У час няўдалага нападу на г. Апатаў схоплены карнікамі і павешаны.

Літ.: Дьяков В. А. Деятели русского и польского освободительного движения в царской армии 1856—1865 гг. (Биобиблиогр. словарь), М., 1967; Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг., М., 1965 (Восстание 1863 г. Материалы и документы).

Г. В. Кісялёў. Вільнюс.

«ЗВЯЗДА», штодзённая грамадска-палітычная газета, орган ЦК КПБ, Вярх. Савета і Савета Міністраў БССР. Разлічана на шырокія колы чытачоў. Асвятляе пытанні грамадска-паліт., эканам. і культ. жыцця рэспублікі, поспехі працоўных у камуніст. буд-ве, міжнар. жыццё, спарт. навіны і інш.



Выдаецца з 27.7(9.8).1917 у Мінску; да ліп. 1924 выходзіла на рус. мове, з 1925 частка матэрыялаў друкавалася на рус., частка — на бел. мове, з жн. 1927 — на бел. мове. Першая на Беларусі легальная масавая бальшавіцкая газета. Спачатку выходзіла як орган Мінскага к-та РСДРП(б). Арганізатары і першыя рэдактары «З.» В. Г. Кнорын, К. І. Ландар, А. Ф. Мяснікоў, В. В. Фамін, М. В. Фрунзе. Праследавалася бурж. Часовым урадам: на № 17 забаронена. 15(28).9—6(19).10.1917 выдавалася як орган Паўн.-Зах. абл. бюро РСДРП(б) пад назвай «Молот»; выйшла 18 нумароў, закрыта Часовым урадам. 8—29.10(21.10—11.11).1917 узнавіла выхад як газета Паўн.-Зах. абл. бюро РСДРП(б) пад назвай «Буревестник»; выдадзена 19 нумароў. З 1(14).11.1917 выходзіць пад першапачатковай назвай «Звезда». Да Кастр. рэв. выкрывала антынар. палітыку Часовага ўрада, палітыку контррэвалюц. і згодніцкіх партый, бурж. нацыяналістаў, прапагандавала праграму бальшавікоў, адыграла вял. ролю ў павышэнні рэвалюц. актыўнасці працоўных Беларусі і салдатаў Зах. фронту, арганізоўвала масы на барацьбу за Сав. ўладу. Была паслядоўніцай бальшавіцкай газ. «Правда». Прапагандавала ленінскія ідэі сацыяліст. рэвалюцыі, надрукавала артыкулы У. І. Леніна «Адказ», «Крызіс наспеў», «Пісьмо да таварышаў», раздзелы з работы «Пагражаючая катастрофа і як з ёй змагацца». У газеце былі выкладзены рашэнні VII (Красавіцкай) Усерас. парт. канферэнцыі, VI з'езду РСДРП(б), змешчаны «Дэкларацыя фракцыі бальшавікоў аб выхадзе з Прадпарламента» і інш. дакументы ЦК РСДРП(б), рэзалюцыі парт. арг-цый, салдацкіх к-таў і калектываў працоўных, якія выступалі з патрабаваннямі ажыццявіць дэмакр. пераўтварэнні, перадаць уладу рэвалюц. пралетарыяту і бяднейшаму сялянству.

З першых дзён перамогі Кастр. рэвалюцыі «З.» змагалася за ўмацаванне Сав. улады, растлумачвала яе сутнасць і задачы. З лют. 1918 у сувязі з ням. інтэрвенцыяй выдавалася ў Смаленску як газета Паўн.-Зах. абл. і Смаленскага губ. к-таў РКП(б). Асвятляла падзеі на франтах грамадз. вайны, барацьбу бел. народа супраць ням. акупантаў. З снеж. 1918 зноў выдаецца ў Мінску. У пач. 1919 змясціла матэрыялы VI Паўн.-Зах. абл. канферэнцыі РКП(б), якая аб'явіла сябе I з'ездам Кампартыі Беларусі, І Усебеларускага з'езду Саветаў, тэкст першай Канстытуцыі БССР, прынятай 3.2.1919. З № 395 ад 9.3.1919 «З.» — орган ЦК КП(б) Літвы і Беларусі, з 1 да 19 крас. 1919 выдавалася ў Вільні, з 1 мая да 8.8.1919 у Мінску. Асвятляла барацьбу бел. і літ. народаў супраць польскіх інтэрвентаў, гераічную абарону Мінска. У сувязі з акупацыяй часткі Беларусі польскімі інтэрвентамі «З.» выходзіла ў Смаленску як штотыднёвік. З 8.6.1920 орган ЦК КП(б) Літвы і Беларусі і Палітаддзела Рэўваенсавета Зах. фронту. З 8.8.1920 выдавалася ў сталіцы рэспублікі. Вял. ролю адыграла як арганізатар працоўных у гады аднаўлення нар. гасп., сацыяліст. індустрыялізацыі, калектывізацыі с. гасп., культ. буд-ва, шырока асвятляла дзейнасць рэсп. парт. арг-цыі, сав. і гасп. органаў, грамадскіх арг-цый. У пач. Айч. вайны выходзіла ў Мінску, потым у Магілёве, Гомелі (да 13.8.1941 укл.), заклікала бел. народ да барацьбы з ням.-фаш. захопнікамі. У маі — вер. 1942 выпускалася падпольна як орган Мінскага падпольнага к-та КП(б)Б. Адыграла вял. ролю ў мабілізацыі і арганізацыі насельніцтва г. Мінска на барацьбу з акупантамі. Выйшла 4 нумары. У выданні і распаўсюджванні газеты ўдзельнічалі падпольшчыкі Мінска: У. С. Казачонак, А. А. Карпусенка, Я. М. Савіцкая, М. П. Рынкевіч, М. П. і М. М. Воранавы, Б. Пупко, М. І. Свірыдаў, С. А. Благаразумаў, сям'я Ц. А. Трафамюка, А. С. Грышын, Х. М. Александровіч, Г. В. Будай, З. Гала, А. А. Яэубчык і інш. № 1 тайна набраны ў ням. друкарні, надрукаваны на канспіратыўнай кватэры М. П. Воранава, № 2 і № 3 — падпольнай друкарняй у доме Т. Якавенкі, № 4 набраны там жа, надрукаваны на канспіратыўнай кватэры П. Хадасевіча, № 5 быў падрыхтаваны да друку, але

ў свет не выйшаў з-за масавых арыштаў падпольшчыкаў Мінска. Рэдактары: № 1 — У. С. Амельянюк, № 2—4 — У. К. Нікіфараў. З 27.1.1943 да 1.7.1944 выдавалася падпольна як орган ЦК КП(б)Б і Мінскага абкома КП(б)Б (у студз. 1943 — лют. 1944 рэдактар М. П. Барашкаў). З 10.7.1944, пасля вызвалення Мінска ад ням.-фаш. захопнікаў, выдаецца ў сталіцы рэспублікі. Узнагароджана ордэнамі Айч. Вайны 1-й ступені (1965) і Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967). Рэдактар М. І. Дзялец (з 1969).

Літ.: Из истории партийно-советской печати Белоруссии, Мн., 1960; Зярніцкі М. Газета «Звязда» ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Беларусі, Мн., 1957; Ягож. Белорусская советская печать в годы иностранной военной интервенции и гражданской войны, Мн., 1963; Булацкий Г. В. Печать Белоруссии в период завершения реконструкции народного хозяйства республики, Мн., 1960; Марцелев С. В. Печать Советской Белоруссии, Мн., 1967; Пыжкоў В. Друк Беларусі ў барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў XXI з'езда КПСС, Мн., 1960; Дастанка М. Е. Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Мн., 1970; Наша «Звязда». 1917—1967 гг., Мн., 1968; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1—2, Мн., 1967—68; Липило П. П. КПБ — организатор и руководитель партизанского движения в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, Мн., 1959, с. 89—90; О партийном подполье в Минске в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944 гг.), Мн., 1961, с. 32—36; Давыдова В. С. В битве за Отечество, у кн.: Герои подполья, в. 1, М., 1970, с. 27—30.

М. І. Дзялец, **М. С. Зярніцкі**, *В. С. Давыдава.* Мінск.

«ЗВЯЗДА» (выдавецтва), гл. *Выдавецтва ЦК КПБ.*

ЗВЯЗДА, 1) назва адной з формаў *баталейкі* (Віцебск, Веліж) у якой панарамная скрынка-сцэна з нерухомымі лялькамі («Пакланенне вешчуноў») устаўлялася ў дэкар. звязду (выш. каля 2,5 *м*), якую вазілі на санях-развалках на *каляды.* 2) Прадмет каляднай абраднасці ў выглядзе рухомай шматпрамянёвай, асветленай знутры воркі на кіі, з якой хадзілі т. зв. *звездары* напярэдадні свята. Пашырана на Беларусі, Украіне і ў Расіі да пач. 20 ст.

Мяркуюць, што назва З. бярэ пачатак у язычніцкіх абрадах славян, калі насілі вобраз свяціла ў час зімовых святаў у гонар адраджэння Сонца.

Г. І. Барышаў. Мінск.

ЗВЯЗКА, дзеяслоў са страчаным ці аслабленым лексічным значэннем, які ўваходзіць у састаўны выказнік як службовае слова. Выражае сувязь іменнай часткі выказніка з дзейнікам. У сучаснай бел. мове ёсць З. незнамянальныя («быць», «з'яўляцца»), паўзнамянальныя («станавіцца», «рабіцца», «выглядаць», «здавацца») і знамянальныя («ісці», «хадзіць», «прачынацца», «сядзець», «спыняцца»). Напр.: «Брат быў матросам», «Чалавек зваўся Іванам», «Ён прачнуўся ўстрывожаны».

ЗВЯНЧАТКА, вёска ў Кісялёва-Будскім с/с Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр саўгаса «Звянчацкі». За 35 *км* на ПнУ ад Клімавіч, 135 *км* ад Магілёва, 6 *км* ад чыг. ст. Шасцёраўка, на шашы Крычаў — Рослаўль (РСФСР). 410 ж., двароў 132 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, сталовая, магазін. Помнік 238 землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗВЯНЯЧЫ, вёска ў Талачынскім р-не Віцебскай вобл.; падпарадкоўваецца Коханаўскаму гарпасяльковаму Савету. Цэнтр калгаса «XX партз'езд». За 24 *км* на ПнУ ад Талачына, 125 *км* ад Віцебска, 1 *км* ад чыг. ст. Коханава, каля шашы г. п. Коханава — Орша (1 *км*) і Мінск — Масква (2,5 *км*). 212 ж., б-ка, адда. сувязі, 2 магазіны.

ЗВЯРЫ, у шырокім сэнсе слова тое, што *млекакормячыя*; у больш вузкім — млекакормячыя атр. драпежных.

ЗГІРОЎСКІ Антон Антонавіч [24.1(6.2).1906, Мінск — 15.7.1942], беларускі савецкі артыст. Засл. арт. БССР (1935). У 1921—37 працаваў у Бел. тэатрам драм. т-ры. Вучань У. Галубка. Выканаўца характарных, камед. роляў. Маст. З. вызначалася дакладным псіхал. малюнкам ролі, лірычнымі фарбамі, мяккім гумарам. Сярод роляў: Васіль («Плытагоны» Галубка), Дудар, Пранашка («Дыктатура», «Дзяўчаты нашай краіны» І. Мікітэнкі), Вася Балабан («Гісторыя пяці хвастоў» Л. Левіна), граф Лундышаў («Гадзіншчык і курыца» І. Качаргі), Кадлуб-Дабравольскі («Сержант Дробаш» Э. Самуйлёнка), Юсаў («Даходнае месца» А. Астроўскага).

Літ.: Звонак А. Антон Згіроўскі, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.

ЗГОННА-НАГОННЫЯ З'ЯВЫ, ваганне ўзроўню вады ў вадаёмах (азёрах, вадасховішчах, морах, акіянах) ад дзеяння ветру. Калі наветраных берагоў узровень вады павышаецца — нагон, калі падветраных панижаецца — згон. Найб. значэнне гэтыя з'явы маюць у вусцях рэк і ў мелкаводных морах і залівах, дзе ваганні ўзроўню дасягаюць 5 *м* і выклікаюць паводкі (вядомыя ленінградскія паводкі, катастрафічныя паводкі ў Нідэрландах, Бельгіі, Вялікабрытаніі). У сав. арктычных морах амплітуда ваганняў узр. вады ад З.-н. з. 1,5—2,5 *м*, на вадаёмах Беларусі 30—35 *см.*

Літ.: Шулейкин В. В. Физика моря, 4 изд., М., 1968.

ЗГОНЫ (гвалты), адработачная феад. павіннасць сялян, часткова і мяшчан Беларусі і Літвы ў 15 — пач. 19 ст.; найб. ранняя форма працоўнай павіннасці. З устанаўленнем у 16 ст. штодзённай паншчыны З. праводзіліся для тэрміновых с.-г. работ звыш *цягла.* Падзяляліся на вялікія (зганялі ўсіх працаздольных) і малыя (1—2 работнікі з гасп. на ворыва і сяўбу), на конныя і пешыя. У адрозненне ад паншчыны на З. прымушаліся працаздольныя з кожнай сям'і, нават кутнікі, якія не мелі ні зямлі, ні двара.

Колькасць і працягласць З. залежала ад плошчы панскай раллі і патрэб у дадатковай рабочай сіле: у Дуброўне (1775) у год 4, у Цімкавічах (1789) 10, у Быцені (1783) 12. З часам колькасць іх павялічвалася. Напр., ва ўладаннях Клецка ў 1714 праводзілася 6 малых і 4 вялікія З., а ў 1791 — 12 і 13 вялікіх. У 2-й пал. 18 ст. найчасцей праводзілася 12 згонаў у год. У залежнасці ад віду работ З., або гвалты, мелі назву *шаўркі, талокі,* работы з разавым пачастункам — абжынкі. У балансе рабочай сілы фальварковай гасп. З. мелі значную ўдзельную вагу. Напр., у Чарнаўчыцах (каля Брэста) у 1792 складалі да 18% адработачных дзён.

Літ.: Леонтович Ф. И. Крестьянский двор в Литовско-Русском государстве, в. 1—3, СПб., 1897—98; Забела Т. Панская гаспадарка на Беларусі і быт падданага сялянства ў другой палове XVIII ст., Мн., 1928. *П. Р. Казлоўскі.* Мінск.

ЗДАБЫВАННЕ КАРАНЯ, алгебраічнае дзеянне, якое заключаецца ў знаходжанні аснавы ступені па зададзеных ступені і паказчыку. З. к. — дзеянне, адваротнае *ўзвядзенню ў ступень.*

Здабыць корань *n*-й ступені з ліку a (падкарэнны выраз) — значыць знайсці такі лік x (корань), *n*-я ступень x^n якога роўная a. Матэм. запіс $x = \sqrt[n]{a}$; знак $\sqrt{}$ — зменены напісанне літары *r* (лац. radix корань). Пры З. к. выконваюцца наст. роўнасці: $\sqrt[n]{ab} = \sqrt[n]{a} \cdot \sqrt[n]{b}$; $\sqrt[n]{\frac{a}{b}} = \frac{\sqrt[n]{a}}{\sqrt[n]{b}}$; $\sqrt[n]{a^m} = (\sqrt[n]{a})^m$; $\sqrt[m]{\sqrt[n]{a}} = \sqrt[mn]{a}$. Калі З. к. *n*-й ступені з ліку $a \neq 0$ разглядаюць у полі *комплексных* лікаў, то гэты корань мае якраз *n* значэнняў. Калі a — сапраўдны дадатны лік, тады адзін з каранёў, які наз. арыфметычным, таксама будзе сапраўдны і дадатны. Пад задачай З. к. часта разумеюць знаходжанне менавіта арыфм. кораня; для яго вылічэння карыстаюцца табліцамі каранёў, лічыльнай лінейкай, прыбліжанымі формуламі.

ЗДАБЫЎНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, сукупнасць галін прамысловасці па здабычы прыродных рэсурсаў з нетраў зямлі, з вады і лясоў для патрэб апрацоўчай прамысловасці, буд-ва, транспарту і інш. галін нар. гаспадаркі. Уключае: вугальную, газавую, лесанарыхтоўчую, нафтаздабыўную, рыбную, слanцавую, тарфяную прамысловасць (гл. адпаведныя арт.), а таксама здабычу жал. руды, каляровых і рэдкіх металаў, нярудных выкапняў, здабычу марскіх звяроў, кітоў і інш.

Да Кастр. рэв. Беларусь лічылася беднай на карысныя выкапні. Нарыхтоўвалася драўніна, у невялікай колькасці здабываліся гліна, мел, торф, жывіца і інш. сыравіна. За гады Сав. улады на тэр. БССР знойдзены вял. запасы калійных соляў, нафты, спадарожнага газу, а таксама вугаль, жал. руда. У 1970 здабыта 17,9 млн. *т* сільвініту, 4234 тыс. *т* нафты, 178,3 млн. $м^3$ спадарожнага газу. Беларуская зямля багата на торф, драўніну, сілікатныя і кварцавыя пяскі, даламіт, вапняк, вогнеўстойлівыя і тугаплаўкія гліны, мел, жвір і інш. буд. матэрыялы. *Ф. А. Дронаў.* Мінск.

ЗДАНОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч (н. 17.7.1927, Орша), дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1954. Скончыў Мінскі юрыд. ін-т (1952). Нар. суддзя Лёзненскага р-на Віцебскай вобл. (1951—59), інструктар Віцебскага абкома КПБ (1959—61), інструктар аддзела адм. органаў ЦК КПБ (1961—66), нам. загадчыка гэтага аддзела (1966—70). З 1970 міністр юстыцыі БССР. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».



ЗДАНОВІЧ Гаўрыла Станіслававіч [н. 12(25).4.1900, в. Крывошын Навагрудскага пав. Мінскай губ.], Герой Сав. Саюза (1945), ген.-м. (1943). З сялян. Чл. КПСС з 1921. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1931). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік разгрому арміі Юдзеніча. У Айч. вайну абараняў Беларусь, ваяваў пад Сталінградам, у Данбасе, на Пд Украіны, у Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі — камандзір стралк. дывізіі. Вызначыўся ў вайну з яп. імперыялістамі ў жн. 1945. Дывізія, якую ўзначальваў З., ажыццявіла наступальную аперацыю ў Маньчжурыі, пераадолела горы Вялікі Хінган, фарсіравала Сіляхэ і выйшла ў раён Фусіня. Жыве ў Варонежы.

ЗДАНОВІЧ Іван Усцінавіч [25.5(6.6).1864, Мінск — 11(24).8.1915], беларускі ўрач, арганізатар шпітальнага абслугоўвання ў Мінскай губ. У 1889 скончыў Кіеўскі ун-т і працаваў у Мінску (гал. ўрач губернскай бальніцы з 1904). Заснаваў школу сляных і школу ўрачэбнай і гігіен. гімнастыкі (1897). Распрацаваў план рэарганізацыі губ. бальніцы ў кваліфікаваную навук.-клінічную ўстанову.

ЗДАНОВІЧ Ігнат Аляксандравіч [1.1.1841, Вільня — 21.12.1863(2.1.1864)], удзельнік паўстання 1863 у Літве і на Беларусі. З сям'і вучонага-літаратуразнаўца. Скончыў Пецярбургскі ун-т (1862) са ступенню канд. матэм. навук. З лют. 1863 у Вільні, касір віленскага паўстанцкага цэнтра і (з жн. 1863) нач. горада. Арыштаваны 29.9.1863. Павешаны на пл. Лукішкі ў Вільні. *Г. В. Кісялёў.* Вільнюс.

ЗДЗЕЛЬНА-ПРАГРЭСІЎНАЯ СІСТЭМА ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ, гл. ў арт. *Заработная платы сістэмы.*

ЗДЗЕЛЬНА-ПРЭМІЯЛЬНАЯ СІСТЭМА ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ, гл. ў арт. *Заработная платы сістэмы.*

ЗДЗЕЛЬНАЯ ЗАРАБОТНАЯ ПЛАТА, форма заработнай платы, пры якой заработак працаўніка вызначаецца ў залежнасці ад выпрацаванай прадукцыі ці выкананых аперацый. Гл. таксама *Заработная плата, Заработная платы сістэмы.*

ЗДЗІТАВА, вёска ў Бярозаўскім р-не Брэсцкай вобл., на р. Дарагабуж, паміж азёрамі Чорным і Спораўскім. Цэнтр сельсавета. За 33 *км* на ПдУ ад Бярозы, 135 *км* ад Брэста, 26 *км* ад чыг. ст. Бронная Гара, на шашы Бяроза — Драгічын. 2492 ж., гасп. 565 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, 2 магазіны.

Упамінаецца ў гістар. дакументах пад 1252. Цэнтр воласці ў Слонімскім княстве, потым — павеце. З 14 ст. ў складзе Вял. кн. Літоўскага. У дакументах пад 1520 З. названа горадам. Далучана да Расіі ў 1795. У Вял. Айч. вайну каля З. ішлі цяжкія баі партызанаў з ням.-фаш. захопнікамі (гл. *Здзітаўская абарона*). Помнік партызанам. Каля З. выяўлены культурны пласт эпохі ранняга феадалізму.


ЗДЗІТАЎСКАЯ АБАРОНА, бой партызанаў брыгад імя Дзяржынскага, «Савецкая Беларусь» і атрада № 345 супраць ням.-фаш. захопнікаў каля в. Здзітава Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл. 3—11.4.1944. Непадалёку ад в. Здзітава базіраваліся партыз. фарміраванні, штаб Брэсцкага партыз. злучэння, Брэсцкі падпольны абком КП(б)Б. Каб правесці аперацыю, гітлераўцы сканцэнтравалі ў Бярозе, Броннай Гары, Няхачаве, Івацэвічах атрады СС, 10 артыл. і мінамётных батарэй, танкі, бронемашыны, бамбардзіроўшчыкі. З тылу на партызанаў наступалі фарміраван-

ні варожых гарнізонаў з раёна Драгічын — Іванава. Цэнтр. група партыз. брыгад і атрадаў, над аховай якіх знаходзілася 10 тыс. мірных жыхароў, апынулася ў акружэнні. На досвітку 3.4.1944 немцы пачалі наступаць на *партызанскую брыгаду імя Ф. Э. Дзяржынскага* (камандзір В. М. Манахаў) і на *партызанскі атрад № 345* (С. А. Яроцкі). Атакі карнікаў былі адбіты.

На трэці дзень немцам удалося ўклініцца ў абарону партызанаў. На дапамогу абаронцам прыйшоў асобна дзейны партыз. атрад імя Будзённага (камандзір К. Е. Мераляков). Страціўшы на гэтым участку 57 салдатаў і афіцэраў, фашысты аноў адступілі і кінулі гал. сілы супраць *партызанскай брыгады «Савецкая Беларусь»* (камандзір М. У. Бабкоў), якая займала абарону ўздоўж р. Дарагабуж і прыкрывала асноўныя партыз. базы. 790 партызанаў брыгады мелі на ўзбраенні 58 кулямётаў, 95 аўтаматаў, 3 процітанкавыя ружжы, ротны мінамёт і інш. Яны падрыхтавалі моцны рубеж абароны — дзоты, акопы, траншэі. 5 крас. пасля бамбардзіровак і паветра і 3-гадзіннай артыл.-мінамётнай падрыхтоўкі гітлераўцы пачалі штурм пераправы. Увесь дзень партызаны паспяхова адбівалі варожыя атакі. Немцы некалькі дзён бамбілі і абстрэльвалі з гармат умацаванні партызанаў. Боепрыпасы ў партызанаў канчаліся. Уначы 11 крас. паводле загаду камандавання партызаны перайшлі на 2-ю лінію абароны паміж в. Здзітава і Спорава. Адыход прыкрываў 2-і ўзвод 3-й роты атрада імя Суворава (камандзір А. З. Шісменны), які 6 гадзін утрымліваў пераправу. Толькі на 7-ы дзень карнікі ўвайшлі ў в. Здзітава і Спорава, але 2-ю лінію абароны штурмаваць не адважыліся. На месцы баёў у Здзітаве пастаўлены помнік.

Літ.: Непокоренная Белоруссия, М., 1963, с. 294—296. *М. Дз. Сікорын.* Бяроза.

ЗДЗІТАЎСКАЯ ЦАРКВА, помнік драўлянага дойлідства 17—18 ст. Пабудавана на правым беразе р. Мухавец у в. Здзітава (Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл.).



Здзітаўская царква. Бакавы фасад і план.

Да квадратнага ў плане агульнага аб'ёму З. ц. з усходу прылягае алтарны прыруб, з захаду — бабінец з хорамі і каркасны тамбур. Нягледзячы на невялікія памеры [(м) 15×10], храм выглядае як манумент. пабудова. Такое ўражанне стварае высокі камбінаваны дах з невял. купалком. Сцены, рубленыя з плашак, вертыкальна ашаляваны дошкамі. Званічка (квадратная ў плане, крыху вужэйшая зверху, крытая шатром) пабудавана асобна ад царквы. *А. Я. Міцянін.* Брэст.

ЗДОБНАЎ Мікалай Васілевіч [9(21).10.1888—15.5.1942], савецкі кнігазнавец і бібліограф. Працаваў у галіне гісторыі бібліяграфіі і краязнаўчай бібліяграфіі, пераважна Урала і Сібіры. У 20—30-я г. ўдзельнічаў у рабоце рус. біблиягр. т-ва Маск. ун-та, Цэнтр. бюро краязнаўства, Дзяржк. цэнтр. кніжнай палаты. Вёў пед. работу па падрыхтоўцы бібліягр. і навук.-бібліягр. кадраў.

Тв.: Указатель библиографических пособий по Уралу, в. 1, М., 1927; Проблемы экономики книги, М., 1929; Основы краевой библиографии, 2 изд., М.—Л., 1931; История русской библиографии до начала XX века, 3 изд., М., 1955; Синхронистические таблицы русской библиографии. 1700—1923, М., 1962.

Літ.: Машкова М. В., Н. В. Здобнов (1888—1942). Очерк жизни и деятельности, М., 1959.

ЗДОЛЬНАСЦЬ, псіхічная асаблівасць індывіда, якая рэгулюе яго паводзіны і з'яўляецца ўмовай паспяховага выканання пэўнай дзейнасці. Своеасаблівае спалучэнне З., якое дае магчымасць найб. паспяхова ажыццяўляць якую-н. дзейнасць, наз. *даравітасцю*; высокая ступень даравітасці — *талент*, найвышэйшая — геніяльнасць (гл. *Геній*). З. не прыроджаныя, але грунтуюцца на прыроджаных задатках — анатама-фізіял. і псіхафізіял. асаблівасцях арганізма. Фарміраванне і развіццё іх залежаць пераважна ад умоў жыцця і дзейнасці чалавека. Некат. бурж. псіхолагі лічаць З. нязменнымі і імкнуцца абгрунтаваць становішча класаў, якія эксплуатуюцца, адсутнасцю ў іх З. У эксплуататарскім грамадстве няма неабходных умоў для фарміравання творчых З. у працоўных. Найленшыя магчымасці ўсебаковага развіцця З. усіх членаў грамадства дае камуніст. лад, асн. прынцып якога — ад кожнага па З., кожнаму па патрэбах.

Сав. псіхалогія вылучае З. агульныя (забяспечваюць адносную лёгкасць і прадукцыйнасць працы, якая патрабуе інтэлектуальнага напружання), спецыяльныя (да музыкі, жывапісу, матэматыкі і інш.) і практычныя (канструктыўна-тэхнічныя, арганізатарскія і інш.). Усебаковае развіццё асобы забяспечвае фарміраванне ўсіх З. у адзінстве, але гэта не здымае неабходнасці выхоўваць пераважна той ці іншы від З. адпаведна са схільнасцямі чалавека. Не існуе людзей, у якіх няма пэўных З. Часам З. пачынаюць развівацца параўнальна позна, і толькі ў працэсе правільнага навучання і выхавання.

Літ.: Ковалев А. Г. и Мясищев В. Н. Психические особенности человека, т. 2 — Способности, Л., 1960; Теплов Б. М. Психология музыкальных способностей, у кн.: Проблемы индивидуальных различий, М., 1961; Способности ваших детей, М., 1969; Леонтьев А. Н. Проблемы развития психики, 2 изд., М., 1965; Крутецкий В. А. Психология математических способностей школьников, М., 1968; Ярошевский М. Г. Развитие ленинских идей в советской психологии способностей, «Вопросы психологии», 1970, № 1. *Л. А. Арсенка.* Мінск.

«ЗДРАВООХРАНЕНИЕ БЕЛОРУССИИ», штомесячны навукова-практычны часопіс па медыцыне, орган Мін-ва аховы здароўя БССР. Выходзіць у Мінску з студз. 1955 на рус. мове. Разлічаны на шырокія колы мед. работнікаў рэспублікі. Асвятляе дасягненні айч. і сусветнай мед. навукі, дзейнасць орга-

наў аховы здароўя Беларусі і іх устаноў, праблемы, над якімі працуюць бел. вучоныя, новыя метады дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі хвароб, праблемы здароўя, барацьбы з хваробамі і траўмамі на прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы, санітарнай культуры гарадоў і вёсак і інш. Рэдактар праф. І. А. Інсараў (з 1967).

ЗДУНОЎ Васіль Фёдаравіч (н. 1924, хутар Іванаўка Верхнеўральскага пав. Арэнбургскай вобл.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). На фронце з 1943, камандзір гарматы. Вызначыўся 1.7.1944 у баі на шашы Магілёў — Мінск каля в. Сунішча. Разлік гарматы пад камандаваннем З. перарэзаў ворагу шлях адступлення, падбіў 2 самаходныя гарматы, 13 аўтамашын і знішчыў шмат жывой сілы праціўніка.

ЗЕБРЫ, жывёлы роду коней атр. няпарнакапытных. Тры віды: горная З., З. Грэві і квага. Пашыраны ў Афрыцы. Паспяхова акліматызуюцца ў СССР (запаведнік Асканія-Нова).



Горная зебра.

Маюць характэрную масць: цёмныя і светлыя палосы чаргуюцца паміж сабой. Даўж. цела да 2,2 м, вышыня ў карку калі 150 см. Грыва прамая, кароткая. На канцы хваста кутас доўгіх валасоў. Каштанчыкі (рагавыя мазолі) толькі на пярэдніх нагах. Зебры траваедныя. Часта пасуцца разам з антылопамі, буйваламі, страўсамі. Жывуць табунамі па 10—30 жывёлін. Вандруюць. Палігамы. У канцы лета самка нараджае 1 дзіцяня. Колькасць З. невялікая.

Літ.: Гл. пры арт. *Млекакормячыя.*

ЗЁВІН Якаў Давыдавіч (парт. псеўд. Валодзя, Сава, Таварыш Павел; 1884, м. Маластоўка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ.— 20.9.1918), адзін з 26 бакінскіх камісараў. Чл. Камуніст. партыі з 1912. З сям'і дробнага гандляра. Удзельнік рэв. 1905—07. У 1904—12 далучаўся да меншавікоў. Вёў рэвалюц. работу ў Баку, Бахмуце, Крывым Розе, Горлаўцы. З 1911 па накіраванні Екацярынаслаўскага к-та РСДРП вучыўся ў парт. школе ў Лонжумо (каля Парыжа), слухаў лекцыі У. І. Леніна. З 1915 чл. Бакінскага к-та РСДРП. Няраз арыштоўваўся (1907, 1908, 1912, 1916). Пасля Лютаўскай рэв. 1917 інструктар Маск. Савета, вёў парт. работу ў Серпухаве, Падольску, Арэхава-Зуеве, Іванаве і інш. З жн. 1917 у Баку, адзін з кіраўнікоў усеаг. стачкі ў вер. 1917. З крас. 1918 чл. Бакінскага СНК, камісар працы. Забіты англ. інтэрвентамі і эсэрамі. Імем З. названы вуліцы ў Баку і ў Краснаполлі (б. Маластоўка).



Літ.: Активные борцы за Советскую власть в Азербайджане, Баку, 1957; Колесникова Н. Н. По дорогам подполья (Из воспоминаний), Баку, 1966. *М. Ф. Мельнікаў.* Крычаў.

ЗЁЕМАНА З'ЯВА, змена даўжыні хвалі святла пры ўздзеянні на атам маг. поля. Адкрыта ў 1896 підэрл. фізікам П. Зееманам (1865—1943). Выяўляецца на расшчапленні спектральных ліній у *атамных спектрах*. Адкрыццё З. з. мела вял. значэнне для доказу існавання электронаў і складанай будовы атама.

З'ЕЗД БЕЛАРУСАЎ-БЕЖАНЦАЎ (Усерасійскі з'езд бежанцаў з Беларусі). Адбыўся 17—21.7.1918 у Маскве. Прысутнічала 227 дэлегатаў — прадстаўнікоў ад бежанцаў з Беларусі, што жылі ў Расіі.

Парадак дня: 1) Справаздача Бел. нац. камісарыята; 2) Бежанскае пытанне; даклады з месцаў, матэрыяльная дапамога, рээвакуацыя, школьная справа, пакрыццё страт ад вайны; 3) Прадстаўніцтва Беларусі на будучай мірнай канферэнцыі народаў; 4) Сучаснае становішча; 5) Аб цэнтр. выканаўчым бежанскім к-це Беларусі.

З'езд прайшоў пад знакам умацавання Сав. улады і непарыўнага адзінства бел. і рус. народаў. Дэлегаты асудзілі здраднікаў бел. народа — бурж. нацыяналістаў. 19 ліп. дэлегацыя з'езду на чале з А. Х. Усціловічам была прынята У. І. Леніным, які перадаў прывітанне з'езду.

Літ.: Протоколы, постановления и материалы Всероссийского съезда беженцев из Белоруссии в Москве 15—21 июля 1918 г., М., 1918; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1, Мн., 1962, с. 380. *У. У. Грамовіч.* Мінск.

З'ЕЗД ВЛКСМ, найвышэйшы орган Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі. Паводле Статута ВЛКСМ склікаецца не радзей аднаго разу ў 4 гады. Дата з'езду і парадак дня аповяшчаюцца не пазней як за паўтара месяца да з'езду.

Нормы прадстаўніцтва на з'езд вызначае ЦК ВЛКСМ. З'езд заслухоўвае і зацвярджае справаздачы ЦК ВЛКСМ і Цэнтр. рэвіз. камісіі, разглядае і зменьвае Статут ВЛКСМ, намячае агульную лінію работы і чарговыя задачы камсамола, выбірае ЦК, які паміж з'ездамі кіруе работай камсамола, і Цэнтр. рэвіз. камісію ВЛКСМ. З 1918 да 1971 адбылося 15 з'ездаў ВЛКСМ. Пра работу з'ездаў ВЛКСМ гл. ў арт. *Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі.*

З'ЕЗД КПБ, найвышэйшы орган Камуністычнай партыі Беларусі. У сваёй дзейнасці кіруецца пастановамі КПСС і яе кіруючых органаў. Склікаецца не радзей аднаго разу ў 5 гадоў, нечарговы — па рашэнні ЦК КП Беларусі або па патрабаванні 1/3 агульнай колькасці членаў парт. арг-цыі рэспублікі.

Нормы прадстаўніцтва на з'езд вызначае ЦК КПБ. З'езд заслухоўвае і зацвярджае справаздачы і даклады ЦК, Рэвіз. камісіі і абмяркоўвае іншыя пытанні парт., гасп. і культурнага буд-ва ў рэспубліцы, выбірае ЦК, які паміж з'ездамі кіруе дзейнасцю партыі, Рэвіз. камісію. З 1918 да 1971 адбылося 27 з'ездаў КПБ. Пра работу з'ездаў КПБ гл. ў артыкулах пра кожны з'езд і ў арт. *Камуністычная партыя Беларусі.*

З'ЕЗД КПСС, вярхоўны орган Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Паводле Статута КПСС склікаецца ЦК не радзей аднаго разу ў 5 гадоў, нечарговы — па ініцыятыве ЦК або па патрабаванні не менш як 1/3 агульнай колькасці членаў партыі, прадстаўленых на апошнім з'ездзе. Дата з'езду і парадак дня аповяшчаюцца не пазней як за

паўтара месяца да з'езду. Нечарговыя з'езды склікаюцца ў двухмесячны тэрмін.

З'езд лічыцца правадзейным, калі на ім прадстаўлена не менш за палавіну ўсіх членаў партыі. Нормы прадстаўніцтва на з'езд вызначае ЦК. З'езд заслухоўвае і зацвярджае справаздачы ЦК, Цэнтр. рэвіз. камісіі і інш. цэнтр. арг-цый партыі, разглядае, зменьвае і зацвярджае Праграму і Статут КПСС, вызначае лінію партыі па пытаннях унутр. і знешняй палітыкі, разглядае і вырашае найважн. пытанні камуніст. буд-ва, выбірае ЦК, які паміж з'ездамі кіруе работай партыі, Цэнтр. рэвіз. камісію, распрацоўвае дырэктывы, якія вызначаюць лінію партыі на пэўны гістар. перыяд, пытанні марксісцка-ленінскай тэорыі. З 1898 да 1971 адбылося 24 з'езды КПСС. Пра работу з'ездаў КПСС гл. ў артыкулах пра кожны з'езд і ў арт. *Камуністычная партыя Савецкага Саюза.*

З'ЕЗД ЛКСМБ, найвышэйшы орган Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. У сваёй дзейнасці кіруецца пастановамі з'ездаў і ЦК ВЛКСМ. Склікаецца не радзей аднаго разу ў 4 гады.

Нормы прадстаўніцтва на з'езд вызначае ЦК ЛКСМБ. З'езд заслухоўвае і зацвярджае справаздачы ЦК, які паміж з'ездамі кіруе работай камсамола, Рэвіз. камісіі, абмяркоўвае пытанні камсамольскай работы ў рэспубліцы, выбірае ЦК, Рэвіз. камісію. З 1920 да 1971 адбылося 24 з'езды ЛКСМБ. Пра работу з'ездаў ЛКСМБ гл. ў арт. *Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі.*

З'ЕЗД ПАРТЫЙНЫХ ГРУП ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КАМІТЭТА РСДРП (першы), адбыўся ў пач. жн. 1905 у Ратамцы (каля Мінска). Прысутнічала 8 дэлегатаў: ад Паўн.-Зах. к-та (2), Мінскай, Віцебскай, Віленскай, Смаргонскай, Бабруйскай груп, прадстаўнік ЦК РСДРП.

Парадак дня: 1) Арганіз. пытанне: прыняцце новага статута і ператварэнне Паўн.-Зах. камітэта ў Паўн.-Зах. саюз РСДРП; 2) Аб адносінах да нацыянальных с.-д. арг-цый; 3) Аб аб'яднанні РСДРП; 4) Аб арганізацыі дэманстрацый. Пратаколы з'езду не знойдзены, таму поўных звестак пра склад дэлегатаў і парадак дня няма.

З'езд прыняў новы статут і ператварыў Паўн.-Зах. к-т у *Паўночна-Заходні саюз РСДРП.* Паводле статута ў саюз увайшлі Мінская, Віленская, Віцебская, Смаргонская, Бабруйская групы РСДРП. Яны атрымалі права выдаваць ад свайго імя парт. л-ру. Работу астатніх арг-цый РСДРП накіроўвалі бліжэйшыя да іх групы саюза. Меншавікі і прымірэнцы навязалі рэзалюцыю пра тое, што с.-д. групы ў адносінах да III з'езду партыі «зусім аўтаномныя», чым насаджалі месніцтва і арганіз. неразбярыху. Аднак пад націскам бальшавікоў з'езд дазволіў групам самастойна звязвацца з цэнтр. ўстановамі партыі, што давала магчымасць бальшавікам Беларусі атрымліваць указанні па кіраўніцтве рэвалюц. рухам непасрэдна ад ЦК РСДРП і газ. «Пролетарий». З'езд прызнаў важнасць аб'яднання ўсіх нацыянальнасцей расійскага пралетарыяту для барацьбы супраць самадзяржаўя і пакінуў за сабою «права ідэйнай барацьбы з нацыяналістычнымі с.-д. партыямі». Тым самым ён пацвердзіў прынцып пралет. інтэрнацыяналізму ў рабочым руху і даў адпор імкненням буйдаўцаў раз'яднаць пралетарыят па нац. адрозненнях. У рэзалюцыі «Пра аб'яднанне абедзвюх частак РСДРП» вітаў першыя крокі ЦК і Арганіз. камісіі па аб'яднанні партыі, патрабаваў хутчэй ліквідаваць расколы у РСДРП. Меншавікі пастаялі на тым, што з'езд прапанаваў часова лічыць цэнтр. органамі партыі «Искру» і «Пролетарий». З'езд прызнаў магчымым праводзіць паліт. дэманстрацыі толькі пры наяўнасці моцных узбр. атрадаў і абавязаў парт. арг-цыі стварацъ іх. Выбраў Паўн.-Зах. к-т з 3 чал. тэрмінам на 1 год. Пасля з'езду цэнтр Паўн.-Зах. саюза перанесены з Вільні ў Мінск.

Літ.: КП(б)Б у рэзалюцыях, ч. 1 (1903—1921 гг.), Мн., 1934, с. 27—28; Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955, с. 240—242; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962, с. 97—98.

М. Я. Шкляр. Мінск.

З'ЕЗД ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА САЮЗА РСДРП (другі), адбыўся ў канцы ліст. 1905 у Мінску. Прысутнічалі дэлегаты ад Мінскай, Віленскай, Бабруйскай, Полацкай, Смаргонскай, Пінскай арг-цый РСДРП, ЦК партыі, Паўн.-Зах. саюза РСДРП.

Парадак дня: 1) Справаздачы з месцаў; 2) Аб рэарганізацыі партыі; 3) Аб ператварэнні Паўн.-Зах. саюза; 4) Аб аб'яднаўчым з'ездзе; 5) Работа сярод сялян; 6) Аб нацыянальных с.-д. арг-цыях.

Пратаколы і рэзалюцыі з'езду не знойдзены. З перыяд. друку за 1905 відаць, што з'езд выказаўся за аб'яднанне партыі і скліканне для гэтага IV з'езду РСДРП. З'езд прызнаў, што з-за змены ўмоў парт. жыцця і работы «далейшае існаванне Паўн.-Зах. саюза ў яго ранейшым выглядзе не адпавядае патрабаванням часу», і пастанавіў ператварыць Паўн.-Зах. саюз РСДРП у абл. арг-цыю, якая ўзначаліла б парт. работу на тэр. ўсяго краю. Выканаць гэтае рашэнне намячалася пасля IV з'езду РСДРП.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Материалы, Мн., 1955, с. 347; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962, с. 131; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, с. 140.

У. В. Скарабагаты. Мінск.

З'ЕЗД ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА САЮЗА РСДРП (трэці), адбыўся 28 мая — пач. чэрв. 1906 (месца і дата заканчэння работы з'езду невядомыя). Дэлегаты з рашаючым голасам ад абл. к-та Паўн.-Зах. саюза, Мінскай, Пінскай, Смаргонскай і Ковенскай груп, Віленскага і Дзвінскага к-таў, Дзвінскай і Віленскай акр. арг-цый РСДРП; з дарадчым ад ЦК, Ашмянскай, Брэсцкай, Востраўскай груп РСДРП, Віленскага к-та сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы з'яўляліся прадстаўнікамі каля 3 тыс. чл. партыі. Па невядомых прычынах не з'явіліся дэлегаты Віцебскай, Бабруйскай, Барысаўскай і Полацкай груп, Віцебскай акр. арг-цыі РСДРП, якія з'яўляліся прадстаўнікамі каля 1500 чл. партыі.

Парадак дня: 1) Аб аб'яднанні з Бундам; 2) Арг-цыя шырокіх мас; 3) План паліт. кампаніі; 4) Адносіны да дырэктыў і рэзалюцый ЦК; 5) Аб Літве; 6) Дадаткі да статута; 7) Аб выдавецтве; 8) Перайменаванне Паўн.-Зах. саюза; 9) Аб канфер. работнікаў [якія вялі рэвалюц. дзейнасць] сярод сялян.

З прычыны арышту многіх бальшавікоў сярод дэлегатаў пераважалі меншавікі. З'езд прыняў праект рэзалюцыі аб'яднання з Бундам, выпрацаваны IV з'ездам РСДРП, прапанаваў ЦК, калі Бунд прыме праект, склікаць канфер. арг-цый Паўн.-Зах. краю для распрацоўкі ўмоў аб'яднання на месцах. Па пытанні арг-цыі мас з'езд рэкамендаваў групам РСДРП ствараць Саветы рабочых дэпутатаў, сялянскія і стачачныя к-ты, саветы беспрацоўных, паліт. клубы, прафес. саюзы і г. д. і абавязаў чл. партыі ўдзельнічаць у гэтых арг-цыях; аднаўляць і ствараць мясцовыя аддзелы чыг. і паштова-тэлегр. саюзаў, якія адыгралі значную ролю ў рэвалюц. руху. Адпак стварэнне Саветаў і інш. масавых арг-цый не звязвалася з падрыхтоўкай узбр. паўстання, што прэчыла бальшавіцкай тактыцы. З'езд далучыўся да плана паліт. кампаніі, прапанаванага ЦК РСДРП, які быў меншавіцкім. З'езд ухваліў рэзалюцыю ЦК аб «свабодзе крытыкі рашэнняў парт. з'ездаў», дазволіў крытыкаваць пастановы цэнтр. і мясцовых кіруючых парт. органаў, чым парушыў прынцып дэмакр. цэнтралізму. Улічваючы, што ступень прамысл. развіцця, сталасць пралетарыяту і задачы сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы розныя, з'езд прызнаў неабходным аб'яднанне сацыял-дэмакратыі Польшчы і Літвы ў агульную арг-цыю. Паколькі Літва ў эканам. і культ. адносінах блізкая да Беларусі і ў іх склалася агульная парт. арг-цыя — Паўн.-Зах. саюз РСДРП, з'езд прызнаў неабходным існаванне для Літвы і Беларусі адзінай абласной парт. арг-цыі і перайменаваў Паўн.-Зах. саюз РСДРП у *Абласны саюз РСДРП Літвы і Беларусі*; Беластоцкую арг-цыю прапанаваў уключыць у с.-д. партыю Польшчы. У дадатках да статута вызначыў нормы прадстаўніцтва на з'езды і канферэнцыі саюза, абавязкі абл. к-та. З'езд прапанаваў абл. к-ту працягваць выданне газ. *«Солдатская жизнь»*, выдаваць перыяд. орган і сялянскую газету, на працягу 3 тыдняў склікаць канфер. работнікаў, якія вялі рэвалюц. дзейнасць сярод сялян.

Літ.: Революционное движение в Белоруссии 1905—1907 гг. Документы и материалы, Мн., 1955, с. 537—541; Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1918 гг.), Мн., 1962, с. 153—154; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, с. 154—156.

У. В. Скарабагаты. Мінск.

З'ЕЗД ПРАФЕСІЙНЫХ САЮЗАЎ БССР, найвышэйшы орган прафсаюзаў БССР. Склікаецца не радзей аднаго разу ў 4 гады.

Нормы прадстаўніцтва і парадак выбараў на з'езд вызначае Беларускі рэспубліканскі савет прафес. саюзаў (Белсаўпроф). З'езд выконвае ў маштабах рэспублікі тыя ж функцыі, што і *з'езд прафесійных саюзаў СССР.* Выбірае Белсаўпроф, які паміж з'ездамі кіруе дзейнасцю прафсаюзаў БССР, і Рэвіз. камісію.

З'ЕЗД ПРАФЕСІЙНЫХ САЮЗАЎ СССР, найвышэйшы орган прафсаюзаў СССР. Паводле статута склікаецца не радзей аднаго разу ў 4 гады.

Нормы прадстаўніцтва і парадак выбараў дэлегатаў на з'езд вызначае ВЦСПС. З'езд заслухоўвае і зацвярджае справаздачы *Усесаюзнага Цэнтральнага Савета прафесійных саюзаў* і Рэвіз. камісіі, зацвярджае Статут прафсаюзаў СССР, вызначае чарговыя задачы прафсаюзаў, заслухоўвае даклады цэнтр. планавых і гасп. органаў і вызначае задачы прафсаюзаў у міжнар. прафес. руху, у барацьбе за выкананне нар.-гасп. планаў, за ўздым матэрыяльнага дабрабыту, паліт. і культ. ўзроўню рабочых і служачых, выбірае ВЦСПС, які паміж з'ездамі кіруе ўсёй дзейнасцю прафсаюзаў, і Рэвіз. камісію. Да ўтварэння СССР (снеж. 1922) у Сав. краіне склікаліся Усерасійскія з'езды прафсаюзаў (гл. *Прафесійныя саюзы*).

З'ЕЗД САВЕТАЎ ЛІТВЫ (І з'езд Саветаў рабочых, беззямельных, малазямельных і чырвонаармейскіх дэпутатаў Літвы). Адбыўся 18—20.2.1919 у Вільні. Прысутнічала 220 дэлегатаў, у т. л. 167 камуністаў.

Парадак дня: 1) Справаздача аб дзейнасці Часовага рэвалюц. рабоча-сялянскага ўрада; 2) Міжнар. становішча і абарона краіны; 3) Аб'яднанне Літвы з Беларуссю; 4) Сав. буд-ва ў цэнтры і на месцах; 5) Зямельнае пытанне; 6) Харч. пытанне; 7) Аднаўленне нар. гасп.; 8) Пытанне пра вярхоўную ўладу ў Літве; 9) Выбары ЦВК Саветаў Літвы.

Улічваючы, што Першы Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб зліцці Літвы і Беларусі ў адну рэспубліку, З. С. Л. ўрачыста абвясціў стварэнне адзінай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (гл. *Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка*) і пастанавіў зліць выбраны ім ЦВК (50 чал., у т. л. 46 камуністаў) з ЦВК Беларусі, выбраць аб'яднаны ўрад. 27.2.1919 у Вільні на сумесным пасяджэнні ЦВК Літвы і Беларусі быў створаны агульны ўрад — СНК на чале з В. С. Міцкявічусам-Капсукасам і агульны ЦВК (100 чал.) на чале з К. Г. Цыхоўскім.

Літ.: Съезды Советов Союза ССР, союзных и автономных советских социалистических республик. Сб. документов, т. 2, М., 1960, с. 209—223.

А. В. Вараб'ёў. Мінск.

З'ЕЗД САВЕТАЎ РАБОЧЫХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ. Адбыўся 19—21.11(2—4.12).1917 у Мінску. Прысутнічала 560 дэлегатаў (⅔ — бальшавікі, ⅓ — левыя эсэры) ад Саветаў Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губ.

Абмеркаваў пытанні: 1) Бягучы момант; 2) Даклады з месцаў; 3) Зямельнае; 4) Харчовае; 5) Арганізацыйная работа; 6) Выбары абласнога Савета.

Дэлегаты з месцаў паведамілі пра арганізацыю органаў Сав. улады і пра іх дзейнасць. У рэзалюцыі па зямельным пытанні з'езд прапанаваў усім Саветам садзейнічаць ажыццяўленню Дэкрэта аб зямлі. З'езд прызнаў уладу Саветаў і СНК, выбраны II Усерасійскім з'ездам Саветаў. Выбраны ім абл. Савет (35 чал.) 26.11(9.12).1917 увайшоў у склад *Абласнога Выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту.*

Літ.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы, т. 2, Мн., 1957, с. 236—239, 257—258, 295, 955; Победа Советской власти в Белоруссии, Мн., 1967, с. 405—406; Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии, ч. 1 (1883—1920), 2 изд., Мн., 1968, с. 385.

А. В. Вараб'ёў. Мінск.

ЗЕЙСКА-БУРЭІНСКАЯ РАЎНІНА, у Амурскай вобл. РСФСР, паміж перадгор'ямі хр. Турана і р. Амур і Зея. Рэльеф пераважна раўнінны, на Пн хвалісты. Выш. 200—300 *м.* Глебы лугава-чарназёмныя, бурыя лясныя і балотныя. На ўзвышаных месцах шыракалістыя лясы і хмызнякі, на раўнінных — бало-

ты. Вырошчваюцца збожжавыя і соя. У бас. Зеі радовішча вугалю.

ЗЕЛАНДЫЯ, дацкае Шэлан (Själland), востраў у Балтыйскім м., паміж п-вамі Ютландыя і Скандынаўскі. Пл. 7,1 тыс. км². Уваходзіць у склад Данії.

Паверхня — узгорыстая раўніна, выш. да 126 м. Берагі моцна парэзаныя. Клімат умераны, марскі. Ападкаў 550 мм за год. Есць дубова-букавыя лясы. На З. жыве каля 43% нас. Данії. Вырошчваюць бульбу, агародніну, збожжавыя, цукр. буракі. Жывёлагадоўля малочнага кірунку, свінагадоўля і птушкагадоўля. На ПнУ в-ва г. Капенгаген — сталіца і найб. прамысловы цэнтр Данії.

ЗЕЛЯНЕВІЧЫ, вёска ў Зеляневіцкім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Зальвянка. Цэнтр саўгаса «Зеляневічы». За 63 км на ПнУ ад Пружан, 163 км ад Брэста, 30 км ад чыг. ст. Ваўкавыск, каля шашы Ваўкавыск — г. п. Ружаны (0,5 км). 321 ж., гасп. 95 (1971). Дзіцячыя яслі-сад, бальніца, вет. пункт, 2 магазіны. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 18 сав. воінаў-адзначскоўцаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗЕЛЯНЁЎ Уладзімір Клаўдзіевіч (15.7.1922, в. Усердзіна Керанскага пав. Пензенскай губ.— 1945), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся на тэр. Камарынскага р-на Палескай вобл. і Чарнігаўскай вобл. 28.9.1943 камандзір узвода сувязі З. пераправіўся цераз Дняпро каля хутара Змеі Чарнігаўскай вобл. і навёў тэлеф. сувязь. З захопленага плацдарма двое сутак карэкціраваў артагонь, што дало магчымасць адбіць 17 контратак. Загінуў на фронце.

ЗЕЛЯНКОВІЧЫ, вёска ў Бярозаўскім с/с Глускага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Світанне». За 27 км на ПдУ ад Глуска, 170 км ад Магілёва, 4 км ад чыг. ст. Ратміравічы. 510 ж., гасп. 156 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. Вёску двойчы (люты 1941, сак. 1943) часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі. Помнік на брацкай магіле 22 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. Мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці 2 партызанаў-землякоў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну; мемарыяльная дошка ў гонар Бабруйскага падпольнага райкома КП(б)Б, Бабруйскага падпольнага райкома ЛКСМБ, рэдакцыі бабруйскай падпольнай газеты, якія ў Айч. вайну размяшчаліся каля З.

ЗЕЛЯПО́ЧЫ, вёска ў Калінкавіцкім р-не Гомельскай вобл., на р. Абедаўка. Цэнтр сельсавета і калгаса «Камунар». За 26 км на ПнУ ад Калінкавіч, 148 км ад Гомеля, 4 км ад чыг. ст. Гарочычы, на аўтамаб. дарозе г. п. Васілевічы — в. Гарочычы. 440 ж., двароў 145 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, магазін. У студз. 1943 вёску спалілі ням.-фаш. захопнікі. 2 помнікі: на магіле 3 партызанаў і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

ЗЕЛЯНСКОЕ (Бабінавіцкае), возера ў бас. Лучосы, левага прытока Зах. Дзвіны, у Лёзненскім р-не Віцебскай вобл. Пл. 1,2 км². Даўж. 2,4 км, найб. шыр. 0,8 км, сярэдняя 0,5 км, найб. глыб. 6,5 м. Катлавіна выцягнута з ПнЗ на ПдУ. Схілы пад ворывам, месцамі зарослыя мяшаным лесам. На возеры 2 плёсы, злучаныя пралівам (шыр. 300 м). Вадазбор (346 км²) узгорыста-марэнны. Праточнае: упадаюць р. Вярхіта (з ПдЗ), 2 ракі з аднолькавай назвай Узменка (з Пн і Пд), выцякае Лучоса. Водзяцца лешч, шчупак, язь, карась, лінь і інш.

ЗЕЛЯНУШКІ (Chloris), род птушак сям. ўюрковых атр. вераб'іных. 2 віды. Пашыраны ў Еўропе, Азіі, Паўн. і Зах. Афрыцы (звычайная З.— Ch. chloris) і ва Усх. Азіі (кітайская З.— Ch. sinica). На Беларусі — звычайная З.



Зеляпушка звычайная.

Даўж. каля 10 см, маса да 30 г. Апярэнне пераважна аліўкава-зялёнае, жаўтаватае на крылах. Звычайная З. пералётная і часткова (на Пд Беларусі) аселая птушка. Жыве пераважна в краю мяшаных лясоў, у садах, парках. Гняздуецца на дрэвах і кустах. Нясе 5—6 лец (1—2 разы на год). Наседжвае 14 дзён. Корміцца пасеннем, ягадамі, насякомымі.

Літ.: Гл. пры арт. *Вераб'іныя*.


ЗЕМБІН, вёска ў Барысаўскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Зара камунізма». За 28 км на ПнЗ ад Барысава, 76 км ад Мінска, 33 км ад чыг. ст. Барысаў; аўтобусная ст. на скрыжаванні аўтамаб. дарог г. Барысаў — г. п. Плешчаніцы, в. Зембін — г. п. Бягомль, в. Зембін — г. п. Лагойск. 942 ж., двароў 294 (1971). Цагельня, лесазавод, лясніцтва. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячы сад, бальніца, вет. пункт, адз. сувязі, 3 магазіны. 2 помнікі: землякам і на брацкай магіле 20 сав. воінаў і партызанаў Айч. вайны. 17.7.1941 ням.-фаш. захопнікі загубілі 927 (паводле ўдакладненых звестак) мірных жыхароў вёскі.

ЗЕМГА́ЛЫ (земігола), стараж. балцкае плямя, якое жыло ў сярэдняй частцы сучаснай Латвіі (басейн р. Ліелупе).


Займаліся земляробствам, жывёлагадоўлай, гандлявалі з суседнімі плямёнамі. У 11 — пач. 13 ст. былі на стадыі распаду племяннога ладу і ўтварэння феад. адносін. Паводле Лаўрэнцьеўскага летапісу ў 1106 полацкія князі Усяславічы зрабілі на З. паход, але пацярпелі паражэнне. У 13 ст. вялі ўпартую барацьбу супраць крыжакоў, у 1290 былі канчаткова заваяваны Лівонскім ордэнам. Пазней разам з інш. плямёнамі ўвайшлі ў склад латышскай народнасці.

Літ.: История Латвийской ССР, т. 1, Рига, 1952. *Г. В. Штыхаў.* Мінск.


ЗЕМЛЕКАРЫСТА́ННЕ, карыстанне зямлёю ў парадку і форме, вызначаных заканадаўствам. Зямля ў СССР — уласнасць дзяржавы, даецца ў карыстанне калгасам, саўгасам, інш. дзярж., каап. і грамадскім прадпрыемствам, арг-цыям і ўстановам для с.-г. і прамысл. вытворчасці, сацыяльна-культурных і інш. грамадскіх патрэб, а таксама грамадзянам для дапаможнай с. гаспадаркі і індывідуальнага буд-ва. Даюць зямлю ў карыстанне на аснове рашэнняў Саветаў Міністраў саюзных і аўт. рэспублік, выканкомаў мясцовых Саветаў дэп. працоўных. Карыстацца зямельнымі ўчасткамі толькі пасля вызначэння іх межаў у натуры (на мясцовасці) паводле *землеўпарадкавання* і выдачы адпа-




ПАЎНОЧНАЕ ПАЎШАР'Е НЕБА



ПАЎДНЕВАЕ ПАЎШАР'Е НЕБА



ЭКВАТАРЫЯЛЬНЫ ПОЯС НЕБА





веднага дакумента. Асн. формы З.— грамадскае (калгасы, саўгасы і інш.) і індывідуальнае (калгасны двор і інш.). Права З. калгасаў, саўгасаў і інш. землекарыстальнікаў засведчваецца дзярж. актамі (гл. *Дзяржаўны акт на права карыстання зямлёю*).

З. ў СССР бясплатнае. Можа быць бестэрміновае або часовае (кароткатэрміновае — да трох гадоў, доўгатэрміновае — ад трох да дзесяці, а па асобных відах З. і больш, але не вышэй 25 гадоў). Калгасам зямля даецца ў бестэрміновае карыстанне. Калгасы, саўгасы, інш. прадпрыемствы, арг-цыі і ўстановы ў вызначаных законам выпадках могуць даваць з замацаваных за імі зямель участкі ў пастаяннае карыстанне (напр., прысядзібныя ўчасткі і службовыя надзелы сваім работнікам). Землекарыстальнікі абавязаны карыстацца ўчасткамі ў мэтах, для якіх яны ім дадзены. Выкарыстанне зямлі для таго, каб мець з яе непрацоўныя даходы, а таксама купля-продаж, залог, завяшчанне, дарэнне, арэнда, самавольны абмен зямельнымі ўчасткамі і інш. здзелкі, якія парушаюць правы дзярж. уласнасці на зямлю, забаронены. Землекарыстальнікі маюць права ў вызначаным парадку ставіць розныя збудаванні, сеяць с.-г. культуры і садзіць лясы, карыстацца сенажацямі, пашаю і інш. ўгоддзямі, карыстацца для патрэб гаспадаркі карыснымі выкапнямі, торфам і воднымі аб'ектамі, якія ёсць на ўчастку, а таксама эксплуатаваць інш. карысныя ўласцівасці зямлі. Іх правы могуць абмяжоўвацца законам дзеля інтарэсаў дзяржавы або інш. землекарыстальнікаў. Землекарыстальнікі пазбаўляюцца права З., калі міне патрэба ў зямельным участку, скончыцца тэрмін, на які ён быў дадзены, ліквідуецца прадпрыемства (арг-цыя), узнікне неабходнасць забраць участак на інш. дзярж. або грамадскія патрэбы, калі ўчастак не апрацоўваецца два гады запар. Асобныя грамадзяне пазбаўляюцца права З. таксама, калі добраахвотна адмаўляюцца ад участка, пераязджаюць на інш. пастаяннае месца жыхарства, спыняюць прац. адносіны, у сувязі з якімі быў дадзены ўчастак, і інш. Гл. таксама *Зямельнае права*, *Зямельны кодэкс Беларускай ССР*, *Землеўладанне*.

Літ.: Гл. да арт. *Зямельнае права*.

М. В. Сторажаў. Мінск.

ЗЕМЛЕПРАХО́ДЦЫ, рускія «служылыя», гандлёвыя або «прамысловыя» людзі, якія ў 16—17 ст. зрабілі геагр. адкрыцці ў Сібіры і на Д. Усходзе — частку *Вялікіх геаграфічных адкрыццяў*.

У выніку іх дзейнасці на канец 16 — пач. 17 ст. значная частка Зах. Сібіры да Енісея уключна была абследавана і далучана да Расіі. Каля 1620 З. дайшлі да Лены. У 1639 І. Ю. Масквіцін першы з еўрапейцаў даслугнуў Ахоцкага м. і плаваў уздоўж яго берагоў. У 1648 Фядот Папоў (Аляксееў) і С. І. Дзяжнёў плавалі ўздоўж берагоў Чукоткі. В. Д. Паярка́ў у 1643—46 і Е. П. Хабараў у 1649—52 ажыццявілі паходы на Амур. У 1697—99 У. В. Атласаў арабіў паход на Камчатку. З. прайшлі ад узбярэжжа Пацыфіка. Ледавітага ак. да пач. межаў Сібіры і Д. Усходу і на працягу 17 ст. адкрылі землі, аб прыродзе і насельніцтве якіх існавалі толькі фантаст. ўлуленні. З. складалі «чарцяжы», карты, апісвалі прыроду і насельніцтва, пасылалі данясенні («скаскі») пра свае адкрыцці.

Літ.: Берг Л. С. История русских географических открытий, 2 изд., М., 1962; Дементьев В. А. и Андрющенко О. Н. История географии, ч. 1., Мн., 1962; История открытия и исследования Советской Азии, М., 1969. *А. Н. Андрушчанка.* Мінск.

ЗЕМЛЕТРАСЕ́ННІ, падземныя штуршкі і ваганні глебы, выкліканыя натуральнымі прычынамі.

Ад сілы прыцяжэння масаў да цэнтра Зямлі, змены скорасці вярчэння Зямлі вакол сваёй восі, перараэмеркавання цяпла ўнутры Зямлі ў нетрах ле адбываюцца пастаянныя працэсы, якія выклікаюць канцэнтрацыю напружанняў і ўтварэнне разлі напружанняў, звязаныя з тэктанічнымі рухамі зямной кары або мантыі, дзе ўзнікае ўдар, наз. ачагом або гіпацэнтрам. Ён звычайна знаходзіцца на глыб. ад некалькіх да 50 *км*, радзей да 200—300 *км* і нават да 500—600 *км*. Праекцыю гіпацэнтра на паверхню Зямлі наз. эпіцэнтрам. Сіла З. на паверхні залежыць ад энергіі ў гіпацэнтры і яго глыбіні. У адпаведнасці з Міжнар. сейсмічнай шкалой сілу З. падзяляюць на 12 балаў. На Зямлі за год бывае некалькі соцень тысяч падземных штуршкоў, моцных — некалькі дзесяткаў. Пры З. вызваляецца да 10^{23} эргаў энергіі. У сярэднім за год на Зямлі ў форме З. вызваляецца $0{,}5 \cdot 10^{19}$ джоўляў энергіі (2% ад усёй энергіі ў целе Зямлі). Некат. моцныя З.: Лісабонскае (1755), Месінскае (1908), Такійскае (1923), у Перу (1970) і інш.; яны суправаджаліся разбурэннем гарадоў і гібеллю многіх тысяч людзей. У СССР найбольш разбуральныя З. за апошні час — Ашхабадскае (1948), Ташкенцкае (1966), Дагестанскае (1970). Вывучае З. *сейсмалогія*. Аналіз сейсмічных даследаванняў і геал. дадзеных дае магчымасць атрымаць звесткі пра раёны, дзе можна чакаць З. (карту гл. на ўкл.). Яны тэрытарыяльна звязаны з раёнамі праяўлення інтэнсіўных сучасных тэктанічных рухаў (у СССР — Карпаты, паўд. ўзбярэжжа Крыма, паўд. раёны Туркменіі, горныя раёны ўсх. ч. Сярэдняй Азіі, Паўд. Сібір, Курыльскія а-вы, усх. палова п-ва Камчатка).

Тэр. Беларусі ў геал. адносінах з'яўляецца часткай Усх.-Еўрап. платформы. Тэктанічныя рухі ў цяперашні перыяд тут праяўляюцца слаба, і З., якія адчуваюцца чалавекам, амаль не бывае. У некат. мясцінах рэспублікі адзначаліся паасобныя вельмі слабыя штуршкі (на ПнУ ад Мінска ў 1887 і на З — у 1909), зарэгістраваны адчувальнымі прыладамі сейсмічныя штуршкі ў зонах глыбінных разрываў зямной кары на Палессі. З. на Беларусі вывучае сейсмічная станцыя Геафізічнай абсерваторыі.

Літ.: Атлас землетрясений в СССР, М., 1962; Горшков Г. П. Землетрясения на территории Советского Союза, М., 1949; Землетрясения в СССР, М., 1961; літ. гл. таксама пры арт. *Сейсмалогія*.

Г. П. Гаршко́ў. Масква.

ЗЕМЛЕЎЛАДА́ННЕ, уладанне зямлёю на пэўных умовах (пры неабавязковым фактычным *землекарыстанні*). Форма З. вызначаецца спосабам вытворчасці.

Пры першабытнаабшчынным ладзе зямля была абшчыннай уласнасцю. Развіццё прадукцыйных сіл і грамадскі падзел працы прывялі да ўзнікнення прыватнай уласнасці на зямлю. Пры рабаўладальніцкім ладзе зямлёю валодалі пераважна рабаўладальнікі. Пры феадалізме намінальным вярхоўным землеўладальнікам была дзяржава, фактычна асн. масай зямлі валодалі феадалы. У 5 зах. губернях (Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай, Віленскай) да адмены прыгоннага права памешчыкам належала 66,8% прыгоднай зямлі, іншым прыватным уладальнікам 13,6, казне 18,6, астатнім землеўладальнікам 1%. Частку зямлі памешчыкі аддавалі ў карыстанне прыгонным сялянам за феад. рэнту — *паншчыну* ці *аброк*. Пасля адмены прыгону З. на Беларусі ў значнай меры аставалася феадальна-прыгонніцкім, саслоўным. Найб. пашыраная разнавіднасць саслоўнай зямельнай уласнасці — дваранскае З. У 1877 *дваранства* Беларусі мела каля 8,4 млн. дзес. прыгоднай зямлі (50,4%). Амаль 1,8% млн. дзес. (10,7%) валодалі царская казна, царква і манастыры. Разнавіднасцю саслоўнага З. былі таксама сялянскія надзельныя землі, плошча якіх перавышала 5,5 млн. дзес. (33,4%). З развіццём капіталізму расце бессаслоўнасць З., зямля становіцца прадметам куплі-продажу, набывае цану. Манаполія прыватнай уласнасці на зямлю — адна з гал. прычын агр. крызісаў. На Беларусі з 1877 да 1905 прыватная зямельная ўласнасць купцоў, ганаровых грамадзян, заможнага сялянства і мяшчан вырасла ў 3,4 раза і дасягнула 2,6 млн. дзес. Аднак да 1905 дваранскае З. было пануючым: 7,5 млн. дзес. (41%), з іх 6,3 млн. дзес. сканцэнтравана ў 2487 *латыфундыях* памерам больш як па 500 дзес. Дробныя вытворцы абязэямельваліся і беднелі. Сялянству належала толькі 7,7 млн. дзес. (42%), на адзін двор прыпадала 10,7 дзес. Каля

70 тыс. сялянскіх гаспадарак (10%) былі беззямельнымі. З 1906 да 1917 размеркаванне зямлі па сац. групах уладальнікаў істотна не змянілася. У вырашэнні агр. пытання КПСС паслядоўна абараняла інтарэсы прац. сялянства (гл. *Аграрная праграма КПСС*). Пасля Кастр. рэв. зямля ў СССР нацыяналізавана і аддадзена працоўным. Ажыццяўляўся паступовы пераход да буйной калект. гасп. У час калектывізацыі большую частку зямлі даяржава перадала на вечнае і бясплатнае карыстанне калгасам (гл. *Калектывізацыя сельскай гаспадаркі*). Пасля 2-й сусв. вайны *аграрныя рэформы* ажыццёўлены ў некат. краінах Еўропы, Азіі, Афрыкі, Лац. Амерыкі. Гл. таксама *Зямельнае права*.

Кр.: Статистика землевладения. 1905 г., в. 11, 13, 19, 27, 34, СПб., 1906—07.

Літ.: Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Полн. собр. соч., т. 3); Яго ж. Аграрная праграма сацыял-дэмакратыі ў першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гадоў, Тв., т. 13 (там жа, т. 16); Яго ж. Аграрнае пытанне ў Расіі к канцу XIX века, Тв., т. 15 (там жа, т. 17); Шабуня К. И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг., Мн., 1962; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти, Мн., 1970; Фих Б. М. Аграрная революция в Белоруссии (1917—1920 гг.), Мн., 1966; Кочетовская Е. Национализация земли в СССР, 2 изд., М., 1952; Социалистические преобразования в экономике Белоруссии в 1917—1920 гг., Мн., 1966; Ленинский декрет «О земле» и современность, М., 1970.

В. П. Панюціч. Мінск.

ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАННЕ, сістэма мерапрыемстваў для рэгулявання зямельных адносін, арганізацыі выкарыстання зямлі як сродку вытворчасці. Змест і задачы З. вызначаюцца спосабам вытворчасці. У капіталіст. грамадстве З. ажыццяўляецца дзеля інтарэсаў пануючых класаў, ахоўвае прыватную ўласнасць на зямлю, накіравана на ўмацаванне і развіццё капіталіст. адносін. Мэта З. пры сацыялізме — ахова зямляў дзеля інтарэсаў усяго грамадства, найб. поўнае і рацыянальнае іх выкарыстанне, павышэнне культуры земляробства. У СССР мае планамерны характар, ажыццяўляецца на землях *адзінага дзяржаўнага зямельнага фонду* за кошт дзярж. бюджэту. Падзяляецца на міжгаспадарчае і ўнутрыгаспадарчае. Асн. задачы: упарадкаванне землекарыстання, ліквідацыя нязручнасцей у землекарыстанні; выяўленне новых земляў для гасп. асваення; унутрыгасп. арг-цыя тэрыторыі калгасаў, саўгасаў і інш. гаспадарак з увядзеннем севазваротаў; распрацоўка мерапрыемстваў па барацьбе з эрозіяй глебы; выдзяленне або адабранне зямельнага ўчастка; вызначэнне або змена межаў гарадоў, пасёлкаў, сельскіх нас. пунктаў; тапографа-геадэзічныя, глебавыя, геабатанічныя і інш. абследаванні. Работы па З. ў рэспубліцы ажыццяўляе Бел. праектны ін-т па землеўпарадкаванні (Белдзіпразем).

Першыя землеўпарадкавальныя работы на тэр. Беларусі вяліся ў 16—17 ст. у сувязі з зямельнай рэформай (гл. *Валочная памера*), накіраванай на ўмацаванне зямельнай уласнасці польскіх і літ. феадалаў. Пасля рэв. 1905 перад З. ставілася мэта рассяліць сялянскую абшчыну (гл. *Сталыпінская аграрная рэформа*). Пасля Кастр. рэв. садзейнічала падзелу памешчыцкіх і манастырскіх зямель між сялянамі. Прынятае ў 1919 «Палажэнне аб сацыялістычным землеўпарадкаванні і аб мерах пераходу да сацыялістычнага земляробства» было накіравана на паступовае аграмаджванне аднаасобнага землекарыстання. У час калектывізацыі задачы і змест З. змяніліся: спачатку праводзіліся землеўказанні (спрошчаныя землеўпарадкавальныя дзеянні), пасля — міжгасп. і ўнутрыгасп. З. сацыялісг. с.-г. прадпрыемстваў. У 1935—37 калгасам выдадзены Дзярж. акты на вечнае карыстанне зямлёй. XVIII з'езд ВКП(б) (1939) прыняў рашэнне пра З. ў калгасах і саўгасах з увядзеннем праларуская ССР па З. займала адно з першых месцаў у СССР. Пасля вайны адноўлены землекарыстанні калгасаў, саўгасаў і інш. землекарыстальнікаў, зроблена ўнутрыгасп. З. Пры ўзбуйненні калгасаў вызначана іх землекарыстанне, праведзена ўнутрыгасп. ўпарадкаванне зямлі. Прыняты ў 1968 Вярх. Саветам СССР Закон аб *асновах зямельнага заканадаўства* Саюза ССР і саюзных рэспублік вызначае змест і кірунак З. ў краіне. Каб прывесці ў адпаведнасць з Асновамі зямельныя заканадаўствы саюзных рэспублік, у 1970 распрацаваны і прыняты рэспубліканскія зямельныя кодэксы. У БССР установлена (1968) званне *заслужаны землеўпарадчык Беларускай ССР*.

Літ.: Земельное право, М., 1969; Землеустроительное проектирование, 5 изд., М., 1969; Вопросы землепользования и землеустройства в Белорусской ССР и Прибалтийских республиках, Мн., 1967; Комплексная организация территории колхозов и совхозов, Мн., 1970; История русского землеустройства (в материалах и документах), М.—Л., 1930.

В. І. Чувічка. Мінск.

ЗЕМЛЯЗНАЎСТВА (агульная фізічная геаграфія), галіна *фізічнай геаграфіі*, якая вывучае агульныя фізіка-геагр. заканамернасці і галоўныя ўласцівасці геагр. абалонкі ўсёй Зямлі.

Літ.: Калесник С. В. Общие географические закономерности Земли, М., 1970; Шубаев Л. П. Общее землеведение, М., 1969.

ЗЕМЛЯНОЎ Серафім Іванавіч (н. 1914, в. Крылоўка Чамбарскага пав. Пензенскай губ.), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС. На фронце з 1942, сапёр. Вызначыўся ў вер. 1943 пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. З групай воінаў да падыходу дывізіі разведаў месцы пераправы і падрыхтаваў плыты. На працягу сутак на плыце перапраўляў пяхоту і процітанкавую артылерыю.

ЗЕМЛЯНЫ АРЭХ, аднагадовая травяністая расліна сям. матыльковых. Гл. *Арахіс*.

ЗЕМЛЯНЫЯ БЛОХІ, тое, што *блошкі*.

ЗЕМЛЯНЫЯ РАБОТЫ, будаўнічыя работы па распрацоўцы грунту ў гідратэхн., дарожным і інш. буд-ве. Займаюць вялікі аб'ём у агульным комплексе буд. работ. З. р. пры здабычы карысных выкапняў наз. *горныя работамі*.

Асн. спосабы З. р.: механічны, гідратэхнічны і выбуховы. Пры мех. спосабе грунт распрацоўваецца землярыйнымі машынамі (бульдозерамі, скрэперамі, экскаватарамі). Грунт транспартуецца да месца ўкладкі машынаю, якая яго распрацоўвае (грэйферамі, скрэперамі), ці інш. транспартнымі сродкамі (аўтамабілямі-самазваламі, чыг. вагонамі, транспарцёрамі і інш.). Раўнуюць грунт найчасцей бульдозерамі і грэйдэрамі, ушчыльняюць каткамі і вібрацыйнымі машынамі. Пры гідратэхн. спосабе З. р. вядуцца гідраманіторамі і земснарадамі. Пры выбуховым спосабе З. р. выкарыстоўваецца сіла выбуху; перамяшчэнне грунту ў патрэбным кірунку робіцца накіраваным выбухам (гл. таксама *Выбуховыя работы*). Шырока выкарыстоўваюцца камбінаваныя спосабы З. р.

Літ.: Драгунов Е. Я., Елшин В. В. и Черников В. Е. Организация земляных работ на строительстве тепловых электростанций, М., 1970.

ЗЕМЛЯНЫЯ ЧЭРВІ, гл. *Дажджавыя чэрві*.

ЗЕМЛЯРОБСТВА, 1) адна з галін грамадскай вытворчасці; састаўная частка с. гасп.

Дае харч. прадукты насельніцтву, сыравіну лёгкай і харч. прамысловасці, кармы с.-г. жывёле. Гал. задачы З.: прадукцыйнае выкарыстанне зямлі, падтрыманне і павышэнне ўрадлівасці глебы, павелічэнне ўраджайнасці с.-г. культур, найбольш поўная механізацыя вытв. працэсаў.

З. вядома з часоў неаліту. На Беларусі было пераважна лядное, або агнявое: высякалі лес, спальвалі дрэвы, апрацоўвалі ляды і засявалі іх. Праз некалькі гадоў пакідалі іх у ялавіну і распрацоўвалі новыя ўчасткі. Лядное З. перайшло ў папаравае (спачатку двухпольнае сістэма: адно поле засявалі, другое пакідалі пад папар; пасля трохпольнае: два палі засявалі, трэцяе — пад папар). У эпоху капіталізму развіваецца таварнае З., удасканальваецца с.-г. тэхніка, выкарыстоўваюцца дасягненні навукі, складваецца спецыялізацыя. Акрамя збожжавых і лёну, вырошчваліся клубне- і каранеплоды, адна- і шматгадовыя травы. Адпак асновай З. ў беднага сялянства заставалася адсталая, прымітыўная тэхніка і агратэхніка. У сялянскіх гаспадарках дарэвалюц. Беларусі было 383 тыс. сох, 294 тыс. драўляных плугоў, 1135 тыс. драўляных барон (1910). Сістэма З. была трохпольнай, толькі некат. заможныя гаспадаркі пераходзілі да шматполля (гл. *Сістэмы земляробства*).

Пасля Кастр. рэв. сацыялісг. рэканструкцыя с. гасп. дала магчымасць развіваць З. на аснове дасягненняў навукі і тэхнікі. На сучасным этапе распрацавана і ўкараняецца навукова абгрунтаваная сістэма З.: павышаецца *агратэхніка*, паляпшаюцца *апрацоўка глебы, насенняводства*, выводзяцца высокаўраджайныя сарты с.-г. культур, у адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі прыроднаэканам. раёнаў уводзяцца *севазвароты*, ажыццяўляецца *меліярацыя*, на аснове *хімізацыі* пар. гасп. шырока ўжываюцца мінер. ўгнаенні, эфектыўная сістэма *аховы раслін*. Умацоўваецца мат.-тэхн. база с. гасп., заканчваецца пераход да комплекснай механізацыі вырошчвання с.-г. культур (гл. *Механізацыя*). Для падрыхтоўкі спецыялістаў З. расшыраецца сетка навуч. устаноў *агранамічнай адукацыі*. У 1970 у калгасах і саўгасах рэспублікі працавала 3669 аграномаў. З. стала высокаінтэнсіўнай галіной. Валавая прадукцыя яго ў параўнанні з 1913 вырасла ў 2,6 раза і склала 49,2% усёй валавой прадукцыі с. гасп. рэспублікі (1970). Павялічыліся пасяўныя плошчы (пераважна за кошт скарачэння папару, асушэння балотаў і забалочаных зямель), змянілася іх структура (гл. табл.).

У 1970 БССР дала 22,6% саюзнай вытворчасці льновалакна, 13,7 бульбы, 2,3% збожжа. Гл. таксама *Сельская гаспадарка, Раслінаводства, Бульбаводства, Буракаводства, Збожжавая гаспадарка, Ільнаводства*.

2) Навука, якая распрацоўвае спосабы найб. рацыянальнага выкарыстання зямлі і павышэння ўрадлівасці глебы для атрымання высокіх ураджаяў. Адна з асн. агранамічных навук. Раздзелы: умовы жыцця с.-г. раслін і іх рэгуляванне, пустазелле і барацьба з ім, апрацоўка глебы, вучэнне пра севазвароты і сістэмы З. Развіваецца ў цеснай сувязі з глебазнаўствам, аграхіміяй, фізіялогіяй раслін, мікрабіялогіяй, метэаралогіяй, фізікай, хіміяй, вучэннем пра сельскагаспадарчыя машыны. Навукова-даследчую работу па Беларусі ў галіне З. ўзначальвае Беларускі НДІ земляробства.

Структура пасяўных плошчаў БССР
(ва ўсіх катэгорыях гаспадарак, %)

	1913	1940	1945	1950	1960	1965	1970
Уся пасяўная плошча	100	100	100	100	100	100	100
Усе збожжавыя культуры	79,9	66,7	73,6	69,0	45,7	47,9	41,4
у т. л.:							
жыта азімае	43,4	30,0	32,2	31,1	25,2	28,4	14,2
пшаніца азімая	1,2	1,5	0,6	0,5	1,1	2,8	7,2
пшаніца яравая	0,7	3,6	3,3	4,3	1,8	0,3	0,1
ячмень	7,9	7,2	12,2	7,1	4,4	6,6	11,8
авёс	19,1	15,2	15,8	13,3	7,1	3,2	4,6
грэчка	4,3	4,7	4,6	6,0	2,3	1,6	0,7
проса	0,6	0,9	1,0	0,9	0,1	0,2	0,0
зернебабовыя	2,0	3,2	3,2	5,6	3,6	4,8	2,8
Тэхнічныя культуры	2,8	6,0	2,7	6,2	5,7	5,9	5,2
у т. л.:							
лён-даўгунец	2,3	5,3	2,4	5,2	4,8	4,7	4,4
цукровыя буракі фабрычныя	—	—	0,1	0,1	0,5	1,0	0,8
Бульба	12,9	17,8	19,4	17,8	18,1	16,6	15,8
Агародніна і бахчавыя культуры	0,9	1,2	1,3	0,9	0,9	0,8	0,8
Кармавыя культуры	3,5	8,3	3,0	6,1	29,6	28,8	36,8

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, раздз. 5, 13, 24, т. 3, раздз. 37, Мн., 1952—53; Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Полн. собр. соч., т. 3); Земледелие и растениеводство в БССР, Мн., 1970 (Сб. научных трудов Белорусского научно-исследовательского ин-та земледелия, т. 14); Почва, удобрение, урожай, Горкі, 1970 (Сб. научных трудов Белорусской сельскохозяйственной академии, т. 72); Пути повышения урожайности сельскохозяйственных культур, Мн., 1969; Основы земледелия, М., 1966; Основы сельского хозяйства, Мн., 1969.

І. Ц. Чарняўскі. Мінск.

ЗЕМЛЯРОБСТВА БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, распрацоўвае тэарэт. і практычныя пытанні земляробства. Арганізаваны ў 1956 на базе Ін-та сацыялісг. с. гасп. АН БССР (з 1937) і Бел. селекцыйнай станцыі (з 1930).

Аддзелы: севазваротаў і апрацоўкі глебаў; аграхіміі; арган. угнаенняў; агратэхнікі збожжавых, зернебабовых і крупяных культур; цукр. буракоў і кармавых каранеплодаў; сіласных культур, лёну; гербіцыдаў; шматгадовых траў; фізіялогіі раслін і радыеактыўных ізатопаў; навук.-тэхн. інфармацыі; вынаходніцтва і патэнтазнаўства. Існуе селекцыйны цэнтр (з 1970) па збожжавых, зернебабовых і крупяных культурах з аддзеламі: селекцыі і першаснага насенняводства пшаніцы; селекцыі і першаснага насенняводства ячменю; селекцыі і першаснага насенняводства грэчкі; селекцыі і першаснага насенняводства зернебабовых культур; насенняводства; лабараторыі: імунітэту, тэхналогіі і біяхіміі. Эксперым. базы «Анопаль», «Бараўляны», «Жодзіна», «Зазер'е», «Вусце»; *Ганусаўская доследна-селекцыйная станцыя па цукровых бураках, Палескал сельскагаспадарчал дослед-*

ная станцыя. Аспірантура з 1956. Прымае да абароны канд. і доктарскія дысертацыі па с.-г. навуках. У ін-це працавалі акад. АН БССР Я. К. Аляксееў, А. К. Кедраў-Зіхман, А. І. Лапо, чл.-кар. АН БССР М. Р. Чыжэўскі; працуе чл.-кар. АН БССР П. Я. Пракопаў. Дырэктар акад. АН БССР В. І. Шэмпель (з 1956).

Асн. кірункі даследаванняў: інтэнсіфікацыя земляробства рэспублікі; распрацоўка агратэхн. асноў палявых севазваротаў і вызначэнне рацыянальнага чаргавання ў іх культур, вызначэнне сістэмы аспоўнай і перадпасяўной апрацоўкі глебаў і сістэмы ўгнаення ў палявых севазваротах на розных глебах; вывучэнне шляхоў павелічэння ўраджайнасці дзярнова-падзолістых глебаў (вапнаванне кіслых глебаў, ужыванне арган. і мінер. угнаенняў); удасканаленне прыёмаў барацьбы са шкоднікамі, хваробамі с.-г. культур і пустаселлем. Выведзена больш як 20 высокаўраджайных сартоў палявых культур: азімага жыта Белта, ячменю Сувенір, яравой пшаніцы Мінская, грэчкі Юбілейная-2, проса Мінскае, кукурузы Палеская; новыя гатункі шматгадовых траў: канюшыны чырвонай, белай і ружовай, люцэрны пасяўной і інш. Наладжана вытворчасць насення эліты і першай рэпрадукцыі збожжавых, зернебабовых, крупяных і інш. с.-г. культур. Выдадзены працы: «Глебы БССР» (1952), «Культура шматгадовых траў у БССР» (1955), «Кукуруза ў БССР» (1957), «Цукровыя буракі на Беларусі» (1963), «Кармавы лубін» (1964), «Селекцыя і насенняводства палявых культур» (1965); манаграфіі: «Агратэхнічныя асновы севазваротаў» П. Я. Пракопава (1967), «Акультурванне лёгкіх глебаў Беларусі» І. Г. Стралкова (1967). Выдаюцца зб. навук. прац.

В. І. Шэмпель. Жодзіна.

ЗЕМЛЯРЫЙКІ, сям. млекакормячых атр. насякомаедных. Гл. *Белазубкі* і *Буразубкі.*

ЗЕМНАВО́ДНЫЯ, амфібіі (Amphibia), клас пазваночных жывёл, прыстасаваных да жыцця ў водным і наземным асяроддзі. Вядома каля 2000 відаў, аб'яднаных у 3 атр. *(бязногія земнаводныя, бясхвостыя земнаводныя, хвастатыя земнаводныя).* Пашыраны ва ўсім свеце, асабліва ў трапічных лясах. На Беларусі 13 відаў. Продкі іх — старажытныя кісцяпёрыя рыбы.

Цела З. укрыта голай, вільготнай, багатай на крывяносныя сасуды скурай. Сэрца трохкамернае, у бязлёгачных саламандраў двухкамернае. Органы перамяшчэння — пяціпальцыя канечнасці. Ёсць бязногія З.— *анамніі.* Размнажаюцца пераважна ў вадзе. Развіццё з поўным ператварэннем (метамарфозай). Лічынкі дыхаюць жабрамі, дарослыя — лёгкімі, скурай, слізістай абалонкай насаглоткі. Т-ра цела залежыць ад т-ры навакольнага асяроддзя *(пайкілатэрмныя жывёлы).* Кормяцца беспазваночн. жывёламі, пераважна насякомымі і іх лічынкамі. Многія карысныя с. гасп. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Жизнь животных, т. 4, М., 1969; Жизнь животных по А. Э. Брему, т. 3, М., 1939; Фауна и экология наземных позвоночных Белоруссии. Мн., 1961.

Т. М. Курскова, Мінск.

ЗЕ́МСКАЯ РЭФО́РМА 1864, рэформа, якая мела на мэце прыстасаваць самадзяржаўны лад Расіі да патрэб капіталіст. развіцця, схіліць лібералаў на бок царызму, каб выкарыстаць іх у барацьбе з рэвалюц. рухам.

Рэформу рыхтавала спец. камісія пры МУС пад старшынствам М. А. Мілюціна (з 1859) і П. А. Валуева (з 1861). Паводле «Палажэння аб губернскіх і павятовых земскіх установах», зацверджанага ў студз. 1864 Аляксандрам II, у Расіі ствараліся губернскія і павятовыя земскія сходы (распарадчыя органы), на якіх выбіраліся земскія ўправы (выканаўчыя органы). Выбары ў земскія сходы праводзілі на аснове высокага маёмаснага цэнзу па 3 курыях — павятовыя землеўладальнікі, гарадскія выбаршчыкі і выбарныя ад сельскіх грамад. Выбарчая сістэма давала перавагу дваранству; рабочыя, дробная буржуазія і інтэлігенцыя ў выбарах не ўдзельнічалі. Рэформа праведзена ў 34 губернях Цэнтр. Расіі. На Беларусі *земствы* уведзены ў 1911.

Літ.: Гл. пры арт. *Земствы.* *В. В. Гетаў.* Мінск.

ЗЕ́МСКАЯ СТАТЫСТЫКА, статыстычныя работы *земстваў* па абследаванні ў аспоўным сельскай гаспадаркі і сялянскіх промыслаў для размеркавання земскіх павіннасцей. Займалася ўлікам надзельнай зямлі. Падзялялася на асн. і бягучую. Асн. ўсебакова вывучала эканам. ўмовы і гасп. становішча сялянства: збіраліся звесткі пра яго колькасць, занятасць, адукацыю, пра зямельныя даходы, колькасць жывёлы і г. д. Метад збору звестак — падворны перапіс; карысталіся таксама выбранымі, т. зв. бюджэтнымі, абследаваннямі некат. тыповых сялянскіх гаспадарак. Бягучая рэгістравала становішча сялянскіх гаспадарак за кожны справаздачны год.

У Расіі ўзнікла ў 70-я г. 19 ст. (першыя даследаванні вяліся ў 1870 і 1871 у Вяцкай і Цярской губ.). На Беларусі пачала развівацца пасля ўтварэння ў сак. 1911 губернскіх земскіх управаў (у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губ.), пры якіх дзейнічалі стат. камітэты. Апошнія правялі перапіс жывёлы ў Мінскай губ. (1915), падворны перапіс жывёлы ў Віцебскай губ. (1915), гарадскі перапіс у Магілёве (1917) і інш., а таксама ўдзельнічалі ва Усерасійскіх с.-г. і пазямельных перапісах 1916 і 1917. Звесткі З. с. мелі важнае значэнне для вывучэння сан.-эканам. развіцця вёскі. Выкарыстоўваючы іх, У. І. Ленін даследаваў працэсы развіцця капіталізму ў с. гасп. Ён адзначаў паўнату даследаванняў, дакладнасць апрацоўкі звестак З. с., аднак крытыкаваў няправільную сістэму групоўкі гаспадарак (па зямельных надзелах, па плошчы пасеву, без уліку сродкаў вытворчасці, наёмнай рабочай сілы) і т. зв. «сярэднія лічбы», пры вывядзенні якіх сціраліся адрозненні сац.-эканам. груп сялянства, затушоўваліся глыбіня і накіраванасць працэсаў дыферэнцыяцыі сялянства і класавага расслаення вёскі.

Кр.: Статистический обзор Могилевской губернии по 1914 г., Могилев, 1915; Материалы переписи скота бывшей Минской губернии 1915 г., Витебск, 1925; Подворная перепись скота в Витебской губернии, произведенная 13—15 июня 1915 г., Пг., 1916; Отчет Минской губернской земской управы за 1913 г., Мн., 1914.

Літ.: Ленін У. І. Развіццё капіталізму ў Расіі, Тв., т. 3 (Полн. собр. соч., т. 3); Яго ж. Да пытання аб задачах земскай статыстыкі, Тв., т. 20 (там жа, т. 24); Яго ж. Да пытання аб нашай фабрычна-заводскай статыстыцы, Тв., т. 4 (там жа, т. 4); Свавицкие З. М. и Н. А. (сост.). Земские подворные переписи 1880—1912. Поуездные итоги, М., 1926; Свавицкий Н. А. Земские подворные переписи (обзор методологии). М., 1961 (бібліягр.); Караваев В. Ф. Библиографический обзор земской статистической и описочной литературы (1864—1903), в. 1—2, СПб., 1906—13.

Л. М. Міхневіч. Мінск.

ЗЕ́МСКІ РУХ, памяркоўна-апазіц. рух бурж.-памешчыцкіх ліберальных элементаў *земстваў* у 2-й пал. 19 — пач. 20 ст. ў Расіі.


Імкнучыся прыстасавацца да капіталіст. развіцця пры захаванні асноў самадзяржаўя, дзеячы З. р. дамагаліся ад урада расшырыць кампетэнцыю земстваў, некаторых паліт. правоў. Рэвалюц. ўздым у канцы 70-х г. ажывіў З. р., але рух гэты заставаўся слабым, паліт. неаформленым, найчасцей — у форме хадайніцтваў. У 1880—82 выдавалася штотыднёвае



Земнаводныя. 1—2. Трытон звычайны (1 — самец, 2 — самка). 3. Жарлянка чырванабрухая. 4—5. Трытон грабеньчаты (4 — самка, 5 — самец). 6. Часночніца звычайная. 7. Рапуха шэрая. 8. Рапуха чарнотная. 9. Рапуха зялёная. 10. Саламандра вогненная. 11. Квакша звычайная. 12. Жаба азёрная. 13. Жаба сажалкавая. 14. Жаба травяная.







Змеі. 1. Каралеўская змяя. 2. Вострагаловая дрэўная змяя. 3. Вадзяны вуж. 4. Гюрза. 5. Эфа пясчаная. 6. Звычайная гадзюка. 7. Палясаты грымучнік. 8. Змяяакулярніца. 9. Мядзянка. 10. Звычайны ўдаў. 11. Сеткаваты пітон.

пая газ. «Земство». У абставінах агр. крызісу і жорсткай рэакцыі 80—90-х г. З. р. амаль замёр. У пач. рэвалюцыі 1905—07 пад націскам рабочага і сялянскага руху на земскіх з'ездах ставіліся палітычныя патрабаванні па рабочым і агр. пытаннях. Палітычныя патрабаванні *Маніфеста 17 кастрычніка 1905* земскія лібералы перайшлі да актыўнай падтрымкі царызму. На канец 1905 перастаў існаваць у сувязі з стварэннем палітычнай партыі кадэтаў і акцябрыстаў, куды ўвайшлі дзеячы З. р.

Літ.: Гл. пры арт. *Земствы. В. М. Горцаў.* Мінск.

ЗЕМСКІЯ САБОРЫ, цэнтральныя саслоўна-прадстаўнічыя сходы на Русі ў сярэдзіне 16—17 ст., якія склікаў цар або мітрапаліт (пазней патрыярх).

У іх удзельнічалі чл. *Баярскай думы*, прадстаўнікі вышэйшага духавенства, дваран, мяшчан. З. с. абмяркоўвалі самыя важныя пытанні знешняй і ўнутр. палітыкі дзяржавы — абвяшчэнне вайны, збіранне войска і сродкаў на яго забеспячэнне, увядзенне новых падаткаў, у перыяд міжцарства выбіралі або зацвярджалі цароў (1584, 1598, 1612, 1613, 1645, 1676, 1682), прымалі рэформы (1549, 1550, 1566, 1642, 1648, 1649, 1682). У 1566 скліканы ў сувязі з Лівонскай вайной, у 1653—54 па пытанні ўз'яднання Украіны з Расіяй і абвяшчэння вайны Рэчы Паспалітай за вызваленне Украіны і Беларусі, у 1683—84 для зацвярджэння «Вечнага міру» з Рэччу Паспалітай. З. с. намагалі царскай уладзе ў барацьбе з рэшткамі феад. раздробленасці, пануючыя класы апіраліся на іх у барацьбе з нар. рухам (1648, 1649, 1650). Спынілі сваю дзейнасць у сувязі з усталяваннем у Расіі абсалютызму.

Літ.: Авалиани С. Л. Земские соборы. Лит. история земских соборов, 2 изд., Одесса, 1916; Тихомиров М. Н. Сословно-представительные учреждения (земские соборы) в России XVI в., «Вопросы истории», 1958, № 5. *В. В. Гетаў.* Мінск.

ЗЕМСКІЯ ШКОЛЫ, пачатковыя сельскія школы ў дарэвалюц. Расіі, заснаваныя пасля *земскай рэформы 1864* на сродкі *земстваў*. У З. ш. выкладаліся: чытанне, пісьмо, арыфметыка і, па магчымасці, спевы. Абавязковае было выкладанне «закону божага».

Да 1911 у Расіі было 27 486 З. ш. Тры чвэрці іх — аднакамплектныя (да 50 вучняў з адным настаўнікам) з 3-гадовым навучаннем, астатнія — двухкамплектныя (больш за 50 вучняў з двума настаўнікамі) з 4-гадовым навучаннем. Мелі прагрэс. значэнне ў распаўсюджванні граматы сярод сялянства. Размяшчаліся звычайна ў малапрыстасаваных для заняткаў памяшканнях. Расходы земстваў на ўтрыманне школ адносіліся да «неабавязковых», найчасцей земствы перакладалі іх на сельскія т-вы. У адрозненне ад міністэрскіх і царкоўна-прыходскіх школ у З. ш. лепш была пастаўлена навуч.-выхаваўчая работа, выкарыстоўваліся лепшыя з дапушчаных падручнікі («Роднае слова» К. Дз. Ушынскага, «Азбука» і кнігі для чытання Л. М. Талстога). На Беларусі стварaліся в 1911 у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губ. Існавалі да 1918.

ЗЕМСНАРАД, судна тэхн. флоту для распрацоўкі і выбірання грунту з-пад вады. Выкарыстоўваецца на земляных работах, што вядуцца спосабам *гідрамеханізацыі*, для паглыблення дна вадаёмаў, здабывання пяску, жвіру, карысных выкапняў.

Адрозніваюць землясосныя і землечарпальныя снарады. Рабочы орган землясоснага снарада — цэнтрабежная помпа, якая ўсмоктвае сумесь грунту з вадою (пульпу). Пульпа транспартуецца па грунтаправодзе, укладзеным на пантонах і па беразе вадаёма. Прадукцыйнасць такіх З. да 1000—1200 $м^3/гадз$, далёкасць транспартавання да 3,5 км. У землечарпальных снарадах бесперапыннага дзеяння рабочы орган — замкнёны чарпаковы ланцуг, з якога грунт накіроўваецца па латках у шаланды, прышвартаваныя да З., або ў сумесі з вадою транспартуецца па грунтаправодзе. Прадукцыйнасць такіх З. да 1200 $м^3/гадз$. Шматчарпаковыя З. для здабычы карысных выкапняў наз. *драгамі*. На распрацоўцы цяжкіх грунтоў карыстаюцца адначарпаковымі З.— відазмененымі *экскаватарамі*, устаноўленымі на пантонах.

Літ.: Шкундин Б. М. Землесосные снаряды, М., 1968; Стариков А. С. Технология работы речных земснарядов, М., 1969; Рощупкин Д. В. Разработка грунтов землесосными снарядами, М., 1969. *А. У. Сапун.* Мінск.

ЗЕ́МСТВЫ, органы мясцовага земскага самакіравання ў Расіі, створаныя паводле *земскай рэформы 1864*. Займаліся мясцовымі гасп. справамі: развіццём гандлю, земляробства, прамысловасці, буд-вам і ўпарадкаваннем дарог, пач. асветай, мед. ўстановамі, паштай, статыстыкай (гл. *Земская статыстыка*), павіннасцямі.

Гал. крыніца даходаў З.— падаткі з нерухомай маёмасці (т. зв. грашовыя павіннасці), якія ішлі на ўтрыманне адм.-судовых і земскіх устаноў, школ, бальніц і інш.; сяляне выконвалі пераважна натуральныя земскія павіннасці: будавалі і папраўлялі дарогі і масты, выстаўлялі падводы, забяспечвалі кватэрамі войскі, адбывалі паштовую павіннасць. З. цалкам падпарадкоўваліся мясцовым органам царскай улады. Большасць месцаў у іх належала памешчыкам, удзельнічалі і прадстаўнікі буржуазіі, духавенства, кулакоў. Нягледзячы на ўрадавыя абмежаванні, дзейнасць З. развівалася пад уплывам нарастання рэвалюц. руху, асабліва з 90-х г., калі ў земскіх сходах і ўстановах удзельнічала разначынная інтэлігенцыя. Імкненне З. выйсці за межы вызначаных урадам кампетэнцый і правоў (гл. *Земскі рух*) выклікала новае палажэнне аб З. (19.7.1890), якое ўзмацніла ўплыў дваран у З. і пазбавіла сялян права выбіраць земскіх гласных; гласных ад сялян назначаў губернатар. У заходніх, у т. л. 3 бел. губернях (Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай), земскія ўстановы — губ. і пав. земскія сходы і ўправы створаны паводле ўказа Сената ад 14.3.1911. Выбіраліся на 3 гады. Ліквідаваны пасля Кастр. рэвалюцыі.

Літ.: Ленін У. І. Ганіцелі земства і Анібалы лібералізма, Тв., т. 5 (Полн. собр. соч., т. 5); Ягож. Па поваду юбілея, Тв., т. 17 (там жа, т. 20); Мыш М. И. (сост.). Положение о земских учреждениях..., СПб., 1894; Весселовский Б. Б. История земства за сорок лет, т. 1—4, СПб., 1909—11. *В. М. Горцаў.* Мінск.

ЗЕ́МШЧЫНА, частка тэрыторыі Рускай дзяржавы, вылучаная ў 1565 Іванам IV у сувязі з *апрычнінай*.

Мела асобнае кіраванне (Баярскую думу, мясцовыя тэрытарыяльныя прыказы), войскі. У З. уваходзілі пераважна ўкраінныя землі: пермскія, вяцкія, парубежныя і северскія гарады, Сярэдняе Паволжа, раёны Старадуба і Абаленска, вобласці Ноўгарада і Пскова, Разань, Вял. Лукі, Смаленск, Цвер, Уладзімір, часткова Масква. Пасля рэарганізацыі апрычніны (1572) З. і апрычныя землі паступова зліліся.

Літ.: Гл. да артыкула *Апрычніна*.

«ЗЕ́МЯ» («Ziemia» «Зямля»), краязнаўчы ілюстраваны часопіс Польскага краязнаўчага т-ва, які выдаваўся з 1.1.1910 да 8.8.1914, з 30.8.1919 да сак. 1920 і з студз. 1922 да ліп. 1939 у Варшаве на польскай мове.

Выходзіў штотыдзень, з студз. 1920 — раз у месяц, з студз. 1926 — два разы, з студз. 1932 — зноў раз у месяц. Друкаваў нарысы, даследаванні з гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры польскага, бел., рус., укр., латышскага, літ., эст. і інш. народаў. Змешчаны матэрыялы пра Віцебск і Віцебшчыну (№ 28—31, 33—34, 36—37, 39, 41—44, 46—47, 1912), пра калядаванне, бел. нар. тэатр. батлейку на Міншчыне (№ 10, 1913), пра гасп. становішча Навагрудскага ваяводства (№ 5, 1922, № 10/12, 1925), возера Нарач (№ 24, 1927, № 6, 1934), нар. мастацтва (№ 6, 1931) і архітэктуру (№ 10/12, 1925) Навагрудчыны, з мінулага Полацкага ваяводства (№ 11, 13—14, 17, 1913), у № 10/12, 1925 — па гісторыі Нясвіжа, Навагрудка, Слоніма, у № 6, 1931 — па гісторыі г. Ліды і інш. У часопісе супрацоўнічалі бел. і польскія фалькларысты, этнографы, археолагі К. Машынскі, М. Федароўскі, В. Шукевіч, Ч. Пяткевіч, Ян Булгак і інш. *Н. А. Ляшковіч.* Вільнюс.


ЗЕНІТ, пункт *нябеснай сферы*, у якім вертыкальная лінія перасякае гэтую сферу над галавой назіральніка.

ЗЕНІТНАЯ АДЛЕГЛАСЦЬ, вуглавая адлегласць свяціла ад зеніту. Гл. *Нябесныя каардынаты.*

ЗЕНІТНАЯ АРТЫЛЕРЫЯ, від артылерыі, прызначанай для проціпаветранай абароны войск і аб'ектаў тылу. Узнікла і развіваецца як сродак барацьбы з авіяцыяй.

Першая процісамалётная аўтамаб. батарэя ў Расіі пачала фарміравацца ў 1914. У грамадз. вайну зенітныя батарэі былі ў ліку першых рэгулярных падраздзяленняў Чырв. Арміі, у 1924 створаны першы зенітны полк. У Вял. Айч. вайну З. а. была магутным сродкам барацьбы з паветраным праціўнікам. Сучасная З. а. аснашчана пушкамі малога (ад 20 да 60 *мм*), сярэдняга (ад 60 да 100 *мм*) і вялікага (больш за 100 *мм*) калібраў, дакладнымі прыладамі кіравання агнём, магутнымі снарадамі, радыёлакацыйнымі станцыямі выяўлення цэляў і наводкі гармат. Вызначаецца хуткастрэльнасцю і меткасцю, можа знішчаць скорасныя самалёты і крылатыя ракеты, а пры неабходнасці адбіваць атакі наземных войск праціўніка.

ЗЕНКЕР (ням. Senker), шматлязовы металарэзны інструмент для апрацоўкі цыліндрычных адтулін і тарцовых паверхняў, папярэдне атрыманых пры адліўцы, коўцы і інш. Адрозніваюць З. (гл. рыс.) суцэльныя, насадныя і зборныя камбінаваныя. Аперацыя апрацоўкі З. наз. зенкераваннем. У параўнанні са свідраваннем зенкераванне забяспечвае больш дакладны напрамак восі апрацаванай адтуліны. З. шырока карыстаюцца для чарнавой і паўчыставой апрацоўкі дэталяў.



Зенкер: *1* — суцэльны; *2* — насадны; *3* — зборны камбінаваны.


Літ.: Гл. пры артыкуле *Металарэзны інструмент.*

ЗЕНЬКАВІЧЫ, вёска ў Уздзенскім с/с Уздзенскага р-на Мінскай вобл., на р. Уздзянка. Цэнтр саўгаса «Уздзенскі». За 5 *км* на ПнУ ад Узды, 79 *км* ад Мінска, 27 *км* ад чыг. ст. Негарэлае. 977 ж., двароў 285 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі і сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, швейная майстэрня, магазін. У сак. 1944 вёску частково спалілі ням.-фаш. захопнікі.

ЗЕНЯВІЧЫ, вёска ў Навагрудскім р-не Гродзенскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса «Нёман». За 24 *км* на Пн ад Навагрудка, 186 *км* ад Гродна, 47 *км* ад чыг. ст. Навасельня. 147 ж., гасп. 42 (1971). Млын, камбінат быт. абслугоўвання. Сярэдняя школа, клуб, аддз. сувязі, магазін. Помнік 48 сав. воінам, партызанам і землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗЕРНЕАЧЫШЧАЛЬНЫЯ МАШЫНЫ, с.-г. машыны для ачысткі і сартавання збожжа.

Да простых машын адносяцца веялка, веялка-сарціроўка, *трыер*, *зерняпульт*; да складаных — З. м. марак ОС-4,5А, СВУ-5, ОВП-20, ЗВС-10Б, трыерны блок БТ-10 і інш. Веялка аддзяляе лёгкія дамешкі паветр. патокам, які ствараецца вентылятарам. Веялка-сарціроўка (напр., «Трыумф»), акрамя таго, сартуе зерне з дапамогай рашотаў. Насенны маторыял ачышчаюць і сартуюць машынамі СВУ-5 і ОС-4,5А (рыс. 1); у іх выкарыстоўваюцца паветр. паток, сістэма рашотаў і трыеры. Прывод ад эл. рухавіка. Прадукцыйнасць ОС-4,5А пры ачыстцы пшаніцы да 4,5 *т/гадз*, насення траў да 250 *кг/гадз*. З. м. ОВП-20 (рыс. 2) прызначана для грубай ачысткі збожжа пасля камбайна і малатарні. Прадукцыйнасць да 20 *т/гадз*. Фрыкцыйны сепаратар («горка») і эл.-магнітная машына раздзяляюць зерневую сумесь па шурпатасці паверхні зярнят і дамешкаў. Рабочы орган «горкі» — нахілены бясконцае палатно, пры руху якога гладкае семя і дамешкі скочваюцца ўніз, а шурпатыя



Рыс. 2. Зернеачышчальная машына ОВП-20.

выносяцца наверх. Эл.-магнітнай машынаю ЭМС-1А ачышчаюць насенне канюшыны, люцэрны, лёну і інш. з дапамогаю электрамагніта і магнітнага парашку. Парашок прыліпае да шурпатых зярнят пустазелля, што дае магчымасць выдзяліць іх з сумесі. Раздзяленне па форме зярнят (напр., вікі ад аўса, гароху ад дамешкаў) робіцца на сарціроўцы «Змейка». Для раздзялення зярнят па ўдзельнай вазе ўжываюць пнеўматычныя сартавальныя сталы ССП-1,5. Каб паменшыць затраты працы на пагрузачна-разгрузачныя аперацыі, простыя З. м. заменьваюцца складанымі, складаныя — зернеачышчальна-сушыльнымі комплексамі. У БССР ужываюцца З. м. ОВП-20, ОС-4,5А і інш., шырока ўкараняюцца зернеачышчальна-сушыльныя комплексы КЗС-5, КЗС-10, КЗС-20.

Літ.: Кожуховский И. Е. и Павловский Г. Т. Механизация очистки и сушки зерна, 2 изд., М., 1968. *Я. Д. Мельцэр.* Мінск.

ЗЕРНЕБАБО́ВЫЯ КУЛЬТУ́РЫ, адна- і шматгадовыя расліны сям. матыльковых. Вядома 60 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Афрыцы і Цэнтр. Амерыцы. У СССР культывуюць *гарох*, *сачавіцу*, *нут*, *віку*, *фасолю*, *сою*, *чыну*, боб (гл. *Боб кармавы*), *арахіс*, *лубін*, лобію, канавалію і інш. Вегетатыўныя органы і асабліва насенне З. к. маюць у 1,5—2,5 раза больш бялку, чым зерне збожжавых. Ідуць на яду, корм жывёле, на зялёнае ўгнаенне. З дапамогаю клубеньчыкавых бактэрый на каранях засвойваюць атмасферны азот і абагачаюць ім глебу, таму ў севааваротах З. к.— каштоўныя папярэднікі для збожжавых і тэхн. культур. У БССР найб. плошчу займае кармавы лубін, вырошчваюцца таксама гарох, пялюшка, віка яравая і азімая, фасоля, боб, горкі лубін.

Літ.: Зернобобовые культуры, Мн., 1963; Алякс е е ў Е. К. Зернебабовыя культуры ў БССР, Мн., 1953; Зернобобовые культуры, Мн., 1966.
І. Ф. Каваленка. Жодзіна.

ЗЕРНЕПАГРУЗЧЫК, машына для пагрузкі і механізаванага праветрывання збожжа.

З. бываюць скрабалкавыя, шнэкавыя і пнеўматычныя. Найб. пашыраны скрабалкавыя са стужачнымі транспарцёрамі. Прыводзяцца ў дзеянне ад электрычнага ці бензінавага рухавіка. Выпускаюцца стацыянарныя ЗП-40, самаперасоўныя ЗПС-60 і ЗПС-100, аўтапагрузчыкі АС-2 (для засыпкі збожжа ў селькі на ходу), навясныя З. і інш. У БССР пашыраны З. маркі ЗПС-60 прадукцыйнасцю да 60 *т/гадз*. Выкарыстоўваюцца на збожжапрыёмных пунктах, таках і складах.

ЗЕРНЕСУШЫЛКА, агрэгат ці ўстаноўка для сушкі збожжа. Бываюць З. простыя (будуюцца паводле тыпавых схем з мясцовых матэрыялаў) і складаныя (механізаваныя); стацыянарныя і перасоўныя. Падзяляюцца на




Схема рэцыркуляцыйнай зернесушылкі: *1*, *2* — вентылятары; *3* — зона канчатковага ахаладжэння; *4* — сушыльная труба; *5* — сепаратар; *6* — шахта; *7* — бункер для сырога збожжа; *8* — зона прамежкавага ахаладжэння; *9* — сумесь прадуктаў гарэння з паветрам; *10* — норыя для звароту збожжа ў сушыльную трубу.

шахтавыя, барабанныя, канвеерныя, вакуумныя і рэцыркуляцыйныя. Збожжа сушыцца ў іх нагрэтым паветрам або сумессю яго з газамі, якія ўтвараюцца пры згаранні паліва ў спец. топках. У БССР пашыраны З. шахтавага і барабаннага тыпу; выкарыстоўваюцца на збожжасховішчах, элеватарах і інш.

У З. з завіслым зернем т-ра цепланосьбіта дасягае 200 °С і больш; у механізаваных з шчыльным зерневым слоем 80 °С для насеннага і 110 °С для таварнага збожжа. Са стацыянарных пашыраны З. шахтавыя СЗС-8, СЗШ-8 і СЗШ-16, барабанныя СЗСБ-8, з перасоўныя — шахтавыя ЗСПЖ-8, барабанныя СЗПБ-2. У Ін-це цепла- і масаабмену АН БССР распрацавана рэцыркуляцыйная З. (гл. рыс.) прадукцыйнасцю 50—60 *т/гадз*. Працуе на прынцыпе рэцыркуляцыі матэрыялу, які прасушваецца, чаргавання нагрэву і ахаладжэння, кантактавага масаабмену.

Літ.: Гержой А. П. и Самочетов В. Ф. Зерносушение и зерносушилки, 4 изд., М., 1967; Любошиц И. Л. Пневмогазовая зерносушилка с контактным массообменом и осциллирующим режимом, у зб.: Тепло- и массоперенос, т. 4, М.— Л., 1963.
І. Л. Любошыц. Мінск.

«ЗЕРНО», нелегальная газета народніцкай групы *«Чорны перадзел»*. Выходзіла ў 1880—81. Была разлічана на рабочых і сялян. Выйшла 6 нумароў: № 1 у Жэневе, № 2 у Расіі, № 3—6 у Мінску (у падпольнай друкарні). Імкнулася растлумачыць сутнасць капіталіст. эксплуатацыі працоўных, значэнне саюзу рабочага класа і сялянства ў рэвалюц. барацьбе супраць самадзяржаўя, пісала пра неабходнасць пашырыць рабочы рух. Аднак думку пра актыўную ролю рабочых у барацьбе з самадзяржаўем газета праводзіла непасля-доўна. Рабочаму класу фактычна адводзілася роля дапаможнага атрада ў рэвалюц. барацьбе. Таму «З.» не стала сапраўднай рабочай газетай. Рэдактары Г. В. Пляханаў, П. Б. Аксельрод, А. П. Буланаў.

Літ.: Цікоцкі М. Я. З гісторыі беларускай журналістыкі XIX ст., Мн., 1960, с. 88—96; Веревкин Б. П. Русская нелегальная революционная печать 70-х и 80-х годов XIX века, М., 1960.
М. Я. Цікоцкі. Мінск.

ЗЕРНЯПУЛЬТ, с.-г. зернеачышчальная машына ці частка яе, якая раздзяляе зерневую сумесь па ўдз. вазе і паруснасці зярнят.

Асн. частка З.— дыск або бясконцая стужка, на якія падаецца струмень зярнят. Пры хуткім іх руху зярняты адкідваюцца на 15—18 *м*; цяжкія, лёгкія фракцыі і смецце раздзяляюцца, падаючы на розных адлегласцях ад З.

ЗЕРНЯЦЁРКА, прылада для ручнога размолвання зерня.

Складаецца з 2 камянёў: ніжняга — вялікага, авальнай формы, зверху звычайна ўвагнутага, і верхняга — меншага, паўшарападобнага. Паявілася ў эпоху неаліту, калі ўзнікла земляробства, і была ва ўжытку да вынаходства *жорнаў* (на Пн Усх. Еўропы, у т. л. на тэр. Беларусі да 5—6 ст.).

ЗЕЎС (Zéus), персанаж старажытнагрэчаскай міфалогіі: вярхоўны бог, бацька і цар багоў і людзей. Яго пастаянным месцам знаходжання лічыўся *Алімп*.

Спачатку быў богам маланкі, грому і дажджу. Пазней аб'яднаў рысы інш. мясцовых багоў, з развіццём рабаўладальніцкіх адносін набыў новыя функцыі: даў людзям законы, усталяваў царскую ўладу, апекаваў нар. сходы, саветы і інш. Лічыцца бацькам многіх алімпійскіх багоў — Апалона, Артэміды, Афрадыты, Гермеса, Дыяніса, герояў — Геракла, Персея і інш. У Рыме культ З. зліўся з культам Юпітэра.

ЗЕЯ, рака ў Амурскай вобл. РСФСР, левы прыток Амура. Даўж. 1242 *км*. Пл. бас. 233 тыс. *км*². Пачынаецца на паўд. схілах Станавога хрыбта на выш. каля 2000 *м*.

У верхнім цячэнні горная рака. Ніжэй г. Зея выходзіць на Амурска-Зейскае плато, цячэнне быстрае, многа перакатаў. Пасля ўпадзення Селемджы і да вусця берагі нізкія, пойма шырокая (да 5 *км*). Гал. прытокі справа Бранта, Гілюй, Уркан; злева Дэп, Селемджа, Том. Жыўленне пераважна дажджавое. Ледастаў з кастр. да красавіка. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці 1820 *м*³/*сек*. Каля г. Зея будуюцца (1971) ГЭС (1,5 млн. *квт*) і вадасх. (пл. 2319 *км*², аб'ём 68,4 *км*³); плаціна яе збераже ад паводак 400 тыс. *га* зямлі. Рыбалоўства (кета, гарбуша, сазан і інш.). Суднаходная да г. Зея. Пры ўпадзенні З. ў Амур г. Благавешчанск. Прыстані: Свабодны, Зея.

ЗІБЕР Мікалай Іванавіч (10.3.1844, пас. Судак Таўрыйскай губ.— 28.4.1888), рускі эканаміст, прапагандыст эканам. ідэй К. Маркса ў Расіі. Апублікаваў артыкулы «Эканамічная тэорыя К. Маркса» (1876—78), у якіх раскрыў змест 1-га т. «Капіталу». Работу З. «Тэорыя каштоўнасці і капіталу Д. Рыкарда...» (1871) К. Маркс назваў каштоўнай кнігай (гл. Капітал, Мн., 1952, т. 1, с. 14). Аднак З. не разумеў карэннага адрознення паміж тэорыяй Д. Рыкарда і рэвалюц. вучэннем К. Маркса, абараняў ідэі дробнабурж. рэфарматарства.

Тв.: Избранные экономические произведения, т. 1—2, М., 1959.

Літ.: Маркс К. Капітал, т. 1, Мн., 1952, с. 14—17; Ленін У. І. Да характарыстыкі эканамічнага рамантызму, Тв., т. 2 (Полн. собр. соч., т. 2); Реуэль А. Л. Русская экономическая мысль 60—70-х годов XIX века и марксизм, М., 1956.

ЗІБІЦКЕР Давід Хаімавіч [н. 14(27).11.1902, в. Іванічы Ігуменскага пав. Мінскай губ.],

беларускі савецкі вучоны ў галіне мікрабіялогіі і імуналогіі. Д-р мед. н. (1961), праф. (1970). Скончыў Мінскі мед. ін-т (1936). Удзельнік Айч. вайны. З 1936 у Бел. НДІ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі. Асн. працы па вывучэнні процііфекц. імунітэту і алергіі, эпідэміялогіі і прафілактыцы інфекц. хвароб. Узнаг. ордэнам Чырв. Зоркі, медалямі.

Тв.: Цитотоксическое действие дифтерийного токсина и титрование дифтерийного антитоксина на культурах тканей, «Журнал микробиологии, эпидемиологии и иммунобиологии», 1963, № 2; Бактериальная и лекарственная аллергия, Мн., 1966; (разам з М. А. Кавалёвым) Бешенство и его профилактика, Мн., 1968.

ЗІГЗА́Г-МАШЫ́НА (ад франц. Zigzag ломаная лінія), швейная машына для ўтварэння зігзагападобнага шва, якое бывае простым (2 шыўкі) і складаным (да 18).

Перапляценне ніткак на З.-м. звычайнае; зігзагападобнае размяшчэнне шыўкоў ствараецца паміж двума праколамі матэрыялу адхіленнем іголкі ўпоперак шва (робіцца кулачковым механізмам). З.-м. прызначана для сшывання матэрыялаў устык, падшыўных і красавікідальных аперацый, аздаблення вырабаў, фастрыгавання ў швейнай, абутковай і галантарэйнай вытворчасці.

ЗІГО́ТА (грэч. zygotos аб'яднаны), клетка, утворапая зліццём мужчынскай і жаночай полавых клетак (гамет) у жывёльных і раслінных арганізмах. Ядры гамет зліваюцца ў адно, але храмасомы кожнай гаметы зберагаюць сваю індывідуальнасць. З. мае двайны набор храмасомаў — дыплоідная фаза развіцця арганізма (гл. *Дыплоід*). Гл. таксама *Апладненне*.

ЗІЗА́НІЙ (Тустаноўскі) Лаўрэнцій (г. н. невяд.— п. каля 1634), беларускі педагог, царкоўны дзеяч, перакладчык. Брат С. *Зізанія*. З дробнамаянтковай шляхты Троцкага ваяв. Працаваў выкладчыкам *брацкіх школ* у Львове (да 1592), Брэсце (1592—95), Вільні (1595—97), хатнім настаўнікам сына крычаўскага старосты Б. Саламярэцкага (1597—1600) і дзяцей князя А. К. Астрожскага (1600—02), пасля ў князя Я. Карэцкага (Карац па Валыні, да 1618). У 1619 пераехаў у Кіева-Пячэрскую лаўру, дзе быў настаўнікам, перакладаў з грэч. мовы, рэдагаваў кнігі. У 1626 прывёз у Маскву напісаны па заданні патрыярха Філарэта «Катэхізіс» (выд. ў перапрац. выглядзе 1627; перавыд. ў Гродне 1783, 1787, 1788), у ім на бел. мове выклаў звесткі з прыроды і даў блізкае да пратэстантызму тлумачэнне царк. догматаў. Погляды З. былі абвешчаны ерэтычнымі. У 1596 у Вільні надрукаваў першы на Беларусі і Украіне буквар «Наука ку читаню и розуменю писма словенскаго» з малюнкамі ў тэксце (выкарыстаў клішэ з выданняў Ф. Скарыны) і «Лексісам» — бел. слоўнікам (1061 слова), які дзякуючы звесткам па гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўстве аблягчаў разуменне стараслав. мовы, набліжаў яе да жывой мовы народа, памагаў пашыраць веды і асвету. «Грамматіка словенска свершеннаго искуства осми частій слова...» (Вільня, 1596) напісана З. у форме пытанняў і адказаў на царкоўнаслав. і бел. мовах. Буквар і грамматыка З., напісаныя для пашырэння асветы і адукацыі сярод нар. мас і для навук. асвятлення пытанняў тагачаснага моваznаўства, мелі значны ўплыў на развіццё моваznаўчай навукі славян. «Граматыку» З. ведалі ў Польшчы, Чэхіі, Балгарыі, Сербіі.

Тв.: Лексис Лаврентія Зизанія.— Синоніма славенороссиая, Кіеў, 1964.

Літ.: Алексютович Н. А. Культурно-просветительная деятельность братьев Зизаниев, у кн.: Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии, Мн., 1962; Подокшин С. Рационалистические и гуманистические идеи во взглядах Стефана и Лаврентия Зизаниев, у кн.: Вопросы философских наук, Мн., 1965; Анічэнка В. В. «Граматыка» Л. Зізанія, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1957, № 4; Ботвинник М. Б. У истоков учебной книги, Мн., 1964. *М. Р. Ларчанка.* Мінск.

ЗІЗА́НІЙ (Тустаноўскі) Стафан (г. н. і см. невяд.), беларускі пісьменнік-палеміст і царкоўны прапаведнік 16 — пач. 17 ст. Брат Л. *Зізанія*. З дробнамаянтковай шляхты Троцкага ваяв. Выкладчык *брацкіх школ* у Львове (з 1586, з 1592 рэктар) і Вільні (1593—99). Першы твор З. «Лист Іеремен патріархи Константинопольского напоминалный...» (Вільня, 1596). У Вільні выдаў па бел. і польскай мовах «Катэхізіс» (1595, не збярогся). На праваслаўным саборы ў Навагрудку (1596) кніга была асуджана як ерэтычная, З. пазбаўлены духоўнага сану і адлучаны ад царквы. Брэсцкім царк. саборам 1596 апраўданы. Аўтар рэліг.-філас. і паліт. памфлета «Казанье святого Кирилла» (Вільня, 1596, перавыд. 1644 у Маскве пад назв. «Книга Кириллова» і ў Гродне ў 1786, 1791 пад назв. «Кириллова книга»), у якім выкрывае посьбітаў феад.-каталіцкай рэакцыі — касцёл, езуітаў, папу рымскага, прыхільнікаў уніі. У кнізе прыкметны ўплыў радыкальна-рэфармац. ідэй таго часу. Асн. рыса вучэння З., якое выяўлялася ў рэліг.-містычнай форме, тыповай для ерэтычнай ідэалогіі сярэдневякоўя,— цесная сувязь з нац.-вызв. барацьбой нар. мас Беларусі і Літвы. Услед за еўрап. гуманістамі і выдатнымі дзеячамі радыкальна-рэфармац. руху патрабаваў верацярпімасці. Рэліг.-філас. погляды З. ў шэрагу момантаў набліжаюцца да вучэння *анабаптыстаў*. Ігнараваў значную частку царк. традыцыі і самастойна інтэрпрэтаваў «свяшчэннае пісанне». Разыходзіўся з касцёлам і праваслаўнай царквой у поглядах на тройцу: лічыў Хрыста ніжэйшым за бога-айца. Часткова адмаўляў вучэнне праваслаўнай царквы пра несмяротнасць душы і замагільны свет. У поглядах на будову свету набліжаўся да стыхійнага матэрыялізму, сцвярджаючы, што «земля, на которой живем, не едина точка впосредку неба, а пред ся колкое мает множество, а небеса небесные еще болше безмерную мают лічбу» («Казанье святого Кирилла»).

Літ.: Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры, т. 1, Мн., 1968; Подокшин С. А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы, Мн., 1970, с. 182—197; літ. гл. таксама пры арт. *Зізаній Л.* *М. Р. Ларчанка.* Мінск.

ЗІКУ́РАТ (цыкурат), ступеньчаты культавы будынак у Ст. Месапатаміі.

Будаваўся з сырцовай цэглы ў выглядзе высокай, у некалькі ярусаў (3—7) вежы, якая звужалася ўверсе. Сцены абкладваліся каляровай глазураванай цэглай, кожны наверх меў свой колер (звычайна чорны, чырвоны, белы). Наверсе размяшчалася свяцілішча, да якога ішлі пандусы і прыступкі. Найб. вядомы зікурат Этэменанкі (т. зв. Вавілонская вежа, 7 ст. да н. э.). Іл. гл. на ўкл. да арт. *Вавілонія*.

ЗІЛЬБЕРБЕРГ-СКУ́ПНІК Яўгенія Уладзіміраўна [1873(?) — ліп. 1942], руская і беларуская савецкая піяністка і педагог. Засл. дз. маст. БССР (1940). Скончыла кансерваторыі ў Пецярбурзе (клас Г. Есіпавай) і ў Вене. У 1933—41 праф. Бел. кансерваторыі. Выступала ў камерных канцэртах (пераважна як ансамблістка). Загінула ў гета ў Мінску.

ЗІМАРО́ДАК ЗВЫЧА́ЙНЫ, зімародак блакітны (Alcedo atthis), птушка сям. зімародкавых атр. ракшападобных. Пашыраны ў Еўропе, Азіі, Паўн. Амерыцы і Паўн. Афрыцы. На Беларусі рэдкая птушка (нар. назва рыбалоў).



Даўж. цела З. з. 170—193 *мм*, маса каля 40 *г*. Мае вял. галаву, доўгую дзюбу (38—45 *мм*), кароткі хвост. Апярэнне бліскучастае зеленавата-блакітнае, брушка светла-каштанавае. На Беларусі З. з. гняздуецца, у некат. месцах пералётны, зрэдку зімуе на адкрытых вадаёмах. Гняздо ў нары, каля самай вады. Нясе 6—7 лец. Корміцца дробнай рыбай.

Літ.: Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967 (бібліягр.).

ЗІМБА́БВЕ, краіна на ПдУ Афрыкі. Гл. *Радэзія*.

ЗІМНІК Леакадзія Баляславаўна (н. 5.9. 1936, в. Чарняўцы Дзісенскага пав. Віленскага ваяводства), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). У 1950—59 калгаспіца калгаса «Гігант» Міёрскага р-на Віцебскай вобл.; з 1959 у калгасе імя Чапаева гэтага р-на: палявод, звеняявая па вырошчванні лёну, з 1970 узначальвае звяно капчатковай прадукцыі.

ЗІМНІЦКІ Сямён Сямёнавіч [12(24).12.1873, в. Малыя Шчыславічы Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ.— 10.12.1927], савецкі вучоны ў галіне клінічнай тэрапіі, заснавальнік айч. школы тэрапеўтаў-функцыяналістаў. Д-р мед. н. (1901), праф. (1906). Скончыў Ваен.-мед. акадэмію ў Пецярбурзе (1898) і працаваў там да 1905 на кафедры факультэцкай тэрапіі. Праф. Казанскага ун-та (1906—27). Асн. працы па функцыянальным клінічным даследаванні страўніка і нырак, па вывучэнні клінікі, дыягностыкі і лячэнні эндакардытаў, парокаў сэрца, язвавай хваробы страўніка.

Тв.: Болезни почек (Брайтова болезнь), Казань, 1924; Лекции по сердечным и почечным болезням, в. 2, М., 1927.

Літ.: Богоявленский В. Ф. Профессор Семен Семенович Зимницкий — врач, ученый, патриот, Казань, 1970.

«ЗІМО́ВАЯ КА́ЗКА» («Зімовыя летуценні»), умоўная назва карнай аперацыі нямфаш. захопнікаў супраць партыз. брыгад 1-й Дрысенскай, «За Савецкую Беларусь», Асвейскай імя Фрунзе, імя Ракасоўскага, імя Суворава Віцебскай вобл., Асобнага латышскага партыз. атрада, некалькіх брыгад і атрадаў з Каліпінскай вобл. Праводзілася ў 14.2 да 20.3.1943 сіламі 10 паліцэйскіх батальёнаў, 3 матарызаваных узводаў жандараў, 3 узводаў зенітнай артылерыі, авіягрупы спец. прызначэння, некалькіх атрадаў СД і інш. З Пн і Пд раён аперацыі быў ачэплены часцямі 201-й ахоўнай і 391-й палявой вучэбнай дывізій. Сумеснымі дзеяннямі партызаны прычынілі карнікам цяжкія страты і прымусілі адступіць. У час аперацыі карнікі загубілі 633 мірных жыхароў, 200 адправілі на катаржныя работы ў Германію, разрабавалі і спалілі 31 вёску, шмат хутароў, захапілі 499 галоў жывёлы.

У. С. Пасэ, А. А. Фактаровіч. Мінск.

ЗІМО́ВЫ ЖО́ЎТЫ, сорт яблыні; гл. *Байкен*.

ЗІМЯ́НІН Міхаіл Васілевіч [н. 8(21).11.1914, Віцебск], савецкі парт. і дзярж. дзеяч. З сям'і чыгуначніка. Чл. КПСС з 1939. Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1939).



З 1940 першы сакратар ЦК ЛКСМБ. У Айч. вайну адзін з арганізатараў камуніст. падполля і партыз. руху на Беларусі. У 1946 сакратар Гомельскага абкома партыі, міністр асветы БССР. У 1947—53 сакратар, другі сакратар ЦК КПБ. З 1953 заг. 4-га Еўрапейскага аддзела і чл. калегіі МЗС СССР, у 1956—57 надзвычайны і паўнамоцны пасол СССР у ДРВ. У 1958—60 заг. Далёкаўсходняга аддзела і чл. калегіі МЗС СССР; у 1960—65 надзвычайны і паўнамоцны пасол СССР у ЧССР. З 1965 нам. міністра замежных спраў СССР. З вер. 1965 гал. рэдактар газ. «Правда». Старшыня праўлення Саюза журналістаў СССР (з вер. 1966). На XIX, XXIII, XXIV з'ездах КПСС выбіраўся чл. ЦК, на XX, XXII чл. Цэнтр. Рэвіз. камісіі КПСС. Дэп. Вярх. Савета СССР 2, 3, 7, 8-га скл., дэпутат Вярх. Савета БССР 2-га і 3-га скл. Узнаг. 2 ордэнамі Леніна, 3 інш. ордэнамі, медалямі.

ЗІНІН Аляксандр Кандратавіч (8.6.1929, Мінск), беларускі савецкі журналіст. З службовцаў. Чл. КПСС з 1958. Скончыў БДУ (1953). У 1950—63 працаваў у рэдакцыі рэсп. газ. «Знамя юности» (з 1959 рэдактар). З 1963 рэдактар рэсп. газ. «Советская Белоруссия». На XXVI і XXVII з'ездах КПБ выбраны чл. ЦК. Дэп. Вярх. Савета БССР 8-га скл. Старшыня Бел. аддз. Т-ва сав.-чэхаславацкай дружбы. Узнагароджаны ордэнам Прац. Чырв. Сцяга, медалямі.

ЗІНІН Мікалай Мікалаевіч [13(25).8.1812, г. Шуша Елізаветпольскай губ.— 6(18).2.1880], рускі хімік-арганік. Акад. Пецярбургскай АН (1865), праф. Казанскага ун-та (1841—48), Медыка-хірург. акадэміі ў Пецярбурзе (1848—64). Скончыў Казанскі ун-т (1833). Сінтэзаваў у 1842 *аніліп*, што дало пачатак развіццю аніліна-фарбавай прамысловасці (гл. *Зініна рэакцыя*). Даследаваў ператварэнні нітразлучэнняў; адкрыў (1845) бензідінавую перагрупоўку (атрымаў азаксібензол,



гідразабензол, бензідзін). Вывучыў выбуховыя ўласцівасці нітрагліцэрыны, у Крымскую вайну 1853—56 прапанаваў начыняць гранаты замест пораху нітрагліцэрынай. Аўтар прац пра вытворныя мачавіны, радыкала алілу і інш. Пачынальнік (з А. А. Васкрасенскім) самастойнай рус. школы хімікаў. Удзельнічаў у стварэнні Рус. хім. таварыства і быў яго прэзідэнтам (1868—78).

Літ.: Фигуровский Н. А. и Соловьев Ю. И. Николай Николаевич Зинин, М., 1957; Гумилевский Л. Зинин, М., 1965 (Жизнь замечательных людей).

ЗІНІНА РЭАКЦЫЯ, метад атрымання араматычных амінаў аднаўленнем нітраазалучэнняў: $RNO_2+3H_2 \rightarrow RNH_2+2H_2O$, дзе R — арганічны радыкал.

М. М. *Зінін* у 1842 аднаўленнем нітрабензолу і α-нітранафталіну сярністым амоніем упершыню атрымаў анілін і α-нафтыламін сінт. метадам, што дало просты спосаб сінтэзу араматычных амінаў з лёгкадаступных нітраазалучэнняў і вызначыла гал. кірунак развіцця арган. сінтэзу і прамысловасці аніліпавых фарбавальнікаў у 19 ст. З. р. шырока карыстаюцца для атрымання амінаў антрахінонавага ряду і вытворчасці анізідзіпаў, хлоранілінаў, нітрасульфакіслот і інш. аднаўленнем іх нітраазалучэнняў.

І. І. Чыжэўская. Мінск.

ЗІНОВІЧЫ, вёска ў Зеляневіцкім с/с Пружанскага р-на Брэсцкай вобл., на р. Зальвянка. Цэнтр Зеляневіцкага с/с. За 62 *км* на ПнУ ад Пружан, 162 *км* ад Брэста, 30 *км* ад чыг. ст. Ваўкавыск, каля шашы Ваўкавыск — г. п. Ружаны (1 *км*). 307 ж., гасп. 95 (1971). Лясніцтва, майстэрні камбіната быт. абслугоўвання, Сярэдняя школа, б-ка, адда. сувязі, сталовая.

ЗІНОЎЕЎ Георгій Васілевіч [20.11(2.12). 1887, Пецярбург — 26.4.1934], савецкі ваенны дзеяч, герой грамадз. вайны. Чл. КПСС з сак. 1917. У арміі з 1908. Скончыў Севастопальскую школу лётчыкаў і з сак. 1917 у авіяцыі 2-й арміі Зах. фронту. Удзельнік Кастр. рэвалюцыі на Беларусі: старшыня ВРК 3-га Сібірскага корпуса, сфарміраваў 1-ы сацыяліст. атрад Зах. фронту і на чале яго ўдзельнічаў у баях супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага і немцаў. З крас. 1918 камандаваў войскамі і Арэнбургскім фронтам па разгроме мяцяжу Дутава; з сак. 1919 — арміямі на Туркестанскім і Закаспійскім франтах, камандуючы Туркестанскага фронту, бліжэйшы памочнік М. В. Фрунзе, вызваляў Орск, Акцюбінск, Бухару. Пасля грамадз. вайны нач. ВПС Ленінградскай ваен. акругі, пам. камандуючага Сярэдне-Азіяцкай і Ленінградскай ваен. акруг, нач. Ваен.-буд. ўпраўлення РСЧА. З 1932 нач. Ваенна-інж. акадэміі РСЧА. Узнаг. 2 ордэнамі Чырв. Сцяга і ганаровай залатой зброяй.

Літ.: Носько М. Белоруссия и Узбекистан, Мн., 1970, с. 31—33. *П. А. Селіванаў.* Мінск.

ЗІНОЎЕЎ Мікалай Анісімавіч (1922, в. Астраўцы Сярдобскага пав. Саратаўскай губ.— 30.6.1944), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). У Чырв. Арміі з 1940. Вызначыўся 30.6.1944 у баі за пераправу цераз Случ каля мяст. Пагост Мінскай вобл. Танк, якім ён камандаваў, быў падбіты. З. з экіпажам уплаў фарсіраваў радзот, размініраваў мост і абараняў яго да падыходу асн. сіл. Загінуў у баі.

ЗІНОЎЕЎ Сцяпан (г. н. і см. невяд.), беларускі і рускі разьбяр па дрэве 17 ст. Выхадзец з Беларусі. Працаваў у Палаце разьбярных і сталярскіх спраў Маскоўскага Крамля. Стварыў (з *Арсеніем* і К. *Міхайлавым*) «Іарданскую сень»; удзельнічаў у вырабе разьбяных іканастасаў цэркваў Данскога манастыра і Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра (1683) і трох цэркваў у Ізмайлаве. Іл. гл. ў арт. *Беларуская рэзь.*

ЗІНЬКОВІЧ Мітрафан Іванавіч [14(27).6. 1900, в. Пячары Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.— 24.9.1943], Герой Сав. Саюза (1943), ген.-м. (1942). З сялян.



Чл. КПСС з 1925. Скончыў Ваен. акадэмію імя Фрунзе (1934). У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны, вызвалення Зах. Беларусі (1939), сав.-фінляндскай вайны 1939—40. У Айч. вайну з 1942 на Бранскім, Цэнтр., Варонежскім франтах — камандзір танкавага корпуса. Вызначыўся 22.9.1943. На чале групы фарсіраваў Дняпро, авалодаў плацдармам і забяспечыў пераправу часцей корпуса. Загінуў у баі. Пахаваны ў Прылуках Чарнігаўскай вобл.

ЗЛАКАВЫЯ (Gramineae), сямейства кветкавых раслін класа аднадольных. Адна-, двух-, шматгадовыя травы, радзей дрэвападобныя расліны (бамбук). Вядома больш за 6 тыс. відаў (500 родаў), пашыраных па ўсім зямным шары. У СССР каля 1000 відаў (150 родаў), на Беларусі больш за 100 відаў (44 роды). Да З. належаць каштоўныя збожжавыя зерневыя культуры (пшаніца, жыта, рыс, ячмень, авёс і інш.), кармавыя (тімафееўка лугавая, аўсяніца лугавая, каласоўнік безасцюковы і інш.), тэхнічныя (цукр. трыснёг). Ёсць сярод З. шкоднае пустазелле (аўсюк звычайны, пырнік паўзучы, каласоўнік аржаны, жыцік п'янючы і інш.).

Карані валасніковістыя; у многіх відаў развіваецца карэнішча. Сцябло — саломіна, выш. ад 1—2 *см* да 20 *м*, звычайна круглае, прамастойнае або паўзучае ці пры аснове каленцасагнутае, вузламі падзеленае на міжвузеллі. Лісце з дойгай вузкалінейнай пласцінкай і цыліндрычнай похвай, якая шчыльна абгортвае сцябло. Кветкі дробныя, жаўтавата-зеленаватыя, сабраныя ў простыя каласкі, якія ўтвараюць складаныя суквецці — колас, мяцёлку, катах і інш. Плод пераважна зярняўка.

Літ.: Флора БССР, т. 1, М., 1949; Определитель растений Белоруссии, Мн., 1987; Жуковский П. М. Ботаника, 4 изд., М., 1964.

Г. В. Пашына. Мінск.

ЗЛАТАГОРАЎ Павел Самойлавіч [17(30).12. 1907, Масква — 24.9.1969], рускі савецкі оперны рэжысёр. Засл. арт. БССР (1940) і РСФСР (1947). Чл. КПСС з 1925. Пасля заканчэння Цэнтр. тэхнікума тэатр. мастацтва (1931) рэжысёр Муз. т-ра імя Неміровіча-Данчанкі, з 1941 — т-ра імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі. Сярод найлепшых работ З. пастаноўкі сав. опер («Вайна і мір» і «Зарунчыны ў манастыры» С. Пракоф'ева, «Бяродны зяць» Ц. Хрэннікава). Адначасова ставіў спектаклі ў многіх т-рах, у т. л. ў Мінску («Рыгалета» Дж. Вердзі, 1935; «Тоска» Дж. Пучыні, 1937), быў гал. рэжысёрам Бел. т-ра оперы і балета (1939—41; пастаноўкі — «Міхась Падгорны» Я. Цікоцкага, 2-я рэд., 1939; «Яўген Анегін» П. Чайкоўскага, «Чыо-Чыо-сан» Пучыні, абедзве 1941). Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

ЗЛАТАЎСТ, горад абл. падпарадкавання ў Чэлябінскай вобл. РСФСР, на р. Ай (бас. Камы). Засн. ў 1754. Чыг. станцыя. 181 тыс. ж. (1970). Значны цэнтр якаснай металургіі і машынабудавання Паўд. Урала. З-ды: металургічны, маш.-буд., абразіўны, металаканструкцый, гадзіннікавы; абутковая і швейная ф-кі, мясакамбінат. Філіял Чэлябінскага політэхн. ін-та. Тэхнікумы: індустрыяльны, металург., сав. гандлю; 2 мед. і пед. вучылішчы. Драм. тэатр.

ЗЛАТНІК, умоўная назва першай рускай залатой манеты, выпушчанай *Уладзімірам Святаславічам* у канцы 10 ст. Кампазіцыйна нагадваў візантыйскі *салід*. Маса каля 4 *г*. Выпуск З. быў эканамічна нявыгадны, меў па сутнасці дэкларацыйны характар. З 11 вядомых экземпляраў златніка 4 (магчыма, 6) з Пінскага скарбу, адкрытага ў 1804.

Літ.: Спасский И. Г. Русская монетная система, 4 изд., Л., 1970; Толстой И. И. Древнейшие русские монеты Великого княжества Киевского, СПб., 1882. *В. Н. Рабцэвіч.* Мінск.

ЗЛАЦІН Яўхім Ізраілевіч [20.8(2.9).1913, Магілёў — 23.8.1965], Герой Сав. Саюза (1943). З рабочых. Чл. КПСС з 1943. У Чырв. Арміі з 1935. У Айч. вайну на Варонежскім, Сцяпным франтах — камандзір мінамётнага ўзвода. Вызначыўся 22—25.9.1943 пры фарсіраванні Дняпра. Узвод пераправіўся на правы бераг і заняў агнявую пазіцыю на в-ве Глінск-Барадаеўск каля Кіева. Адбіў некалькі варожых контратак, знішчыў 9 кулямётных і 3 мінамётныя кропкі.



ЗЛАЧЫННАСЦЬ, сукупнасць злачынстваў, што ўчыняюцца ў пэўным грамадстве, на пэўнай тэрыторыі за канкрэтны перыяд. Узнікла з паяўленнем прыватнай уласнасці і раздзяленнем грамадства на класы. Арганічна ўласціва эксплуататарскаму грамадству.

Эксплуатацыя чалавека чалавекам, паліт. і сац. нераўнасць, што існуе ў класавым грамадстве, спарадзіла З. і з'яўляецца яе прычынай. З узмацненнем эксплуатацыі, павелічэннем беспрацоўя, беднасці і галечы, маральнай дэградацыяй у бурж. грамадстве ў перыяд імперыялізму З. дасягнула найвышэйшага ўзроўню. У ЗША ў 1969 на кожныя 100 тыс. жыхароў прыпадала 2473 злачынствы, у Англіі ў 1970 — 2707, у ФРГ у 1970 — 4159. Штогод у гал. капіталіст. краінах З. расце на 6—18%. У ЗША ў 1960 учынена звыш 2 млн. злачынстваў, у 1969 — каля 5 млн. (выраслa за 10 гадоў амаль у 2,5 раза), у ФРГ у 1965 — 1,7 млн. злачынстваў, у 1970 — 2,4 млн. (за 6 гадоў выраслa на 41%). У структуры З. ЗША пераважаюць цяжкія злачынствы: забойствы (у 1960 — 9000, у 1969 — 14 590), згвалтаванні (у 1960 — 16 900, у 1969 — 36 470), рабаванні (у 1960 — 107 000, у 1969 — 297 000). Пашыраецца З. сярод непаўналетніх (непаўналетніх злачынцаў у Англіі 33%, у ЗША 49%), яна расце хутчэй, чым сярод дарослых, у Англіі, напр., у 3 разы. Для капіталіст. краін характэрна арганізаваная і прафесійная З. (гл. *Гангстэрызм*).

З. арганічна не ўласцівая сацыяліст. грамадству. Пры сацыялізме ліквідаваны яе карэнныя сац. прычыны: эксплуатацыя, беспрацоўе, галеча. Аднак З. існуе ў СССР з-за таго, што асталіся пражыткі мінулага ў свядомасці асобнай часткі грамадзян і з-за варожай дзейнасці імперыял. дзяржаў, накіраванай супраць сацыяліст. краін. У першыя гады Сав. улады З. адлюстроўвала вострую класавую барацьбу. Сярод злачынцаў былі класавыя ворагі Сав. улады (прадстаўнікі буржуазіі, памешчыкаў, кулакоў, агенты замежных дзяржаў). Сацыяльна-эканам. пераўтварэнні ў СССР садзейнічаюць скарачэнню З. За апошнія 40 гадоў колькасць злачынстваў скарацілася ў 3,5 раза (у БССР узровень З. скараціўся ў 6 разоў). Рост дабрабыту, культурнага ўзроўню і свядомасці працоўных, актыўная дзейнасць дзярж. органаў і грамадскасці па барацьбе са З. ствараюць умовы для канчатковай яе ліквідацыі ў СССР і ў інш. сацыяліст. краінах. Гл. таксама *Крыміналогія.*

Літ.: Гл. пры арт. *Крыміналогія.*

П. А. Дубавец. Мінск.

ЗЛАЧЫНСТВА, грамадска небяспечнае дзеянне, за якое законам прадугледжана крымінальная адказнасць. Сукупнасць пэўных элементаў (аб'ект, аб'ектыўны і суб'ектыўны бок, суб'ект) утварае склад З.

Паводле сав. права аб'ект З.— сав. грамадскі і дзярж. лад, сацыяліст. правапарадак, сацыяліст. ўласнасць, сацыяліст. сістэма гаспадаркі, асоба, паліт., працоўныя, маёмасныя і інш. правы грамадзян. Аб'ектыўны бок З. ўключае знешні (фізічны) бок дзеяння; час, месца, спосаб учынення З.; грамадска небяспечныя вынікі і прычынную сувязь паміж дзеяннем (бяздзеяннем) і вынікамі. Суб'ектыўны бок З.— псіхічныя адносіны асобы да З., якое яна робіць. Гэтыя адносіны характарызуюцца канкрэтнай формай віны, матывам і мэтай З. Суб'ект З.— фізічная асоба пэўнага ўзросту ппы поўнай памяці. У залежнасці ад грамадскай небяспекі заканадаўства падзяляе З. на цяжкія, менш цяжкія, малазначныя; за іх прадугледжваецца крымін. адказнасць або меры грамадскага ўздзеяння. Крымін. адказнасць настае з 16 гадоў, а за некат. З. з 14 гадоў (арт. 10 КК БССР).

Сав. крымін. права дае наступную класіфікацыю З.: *дзяржаўныя злачынствы, злачынствы супраць асобы, злачынствы супраць сацыялістычнай і асабістай уласнасці, гаспадарчыя злачынствы, вайсковыя злачынствы* і інш. Крымін. заканадаўства бурж. краін ахоўвае грамадскія адносіны, у існаванні якіх зацікаўлены эксплуататарскія класы. Гл. таксама *Злачыннасць, Адказнасць.*

Літ.: Пионтковский А. А. Учение о преступлении по советскому уголовному праву, М., 1961; Кудрявцев В. Н. Теоретические основы квалификации преступлений, М., 1963; Кузнецова Н. Ф. Преступление и преступность, М., 1968.
А. А. Прымачонак. Мінск.

ЗЛАЧЫНСТВЫ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ, гл. *Акупацыйны рэжым.*

ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ АСОБЫ, грамадска небяспечныя дзеянні, накіраваныя супраць жыцця, здароўя, свабоды і годнасці асобы. Ахова асобы, яе правоў і інтарэсаў замацавана ў Канстытуцыі СССР і з'яўляецца адной з найважнейшых задач сацыялісц. законнасці.

Паводле дзейнага КК БССР (арт. 100—129) да З. с. а. належаць: забойства, давядзенне да самагубства і інш. дзеянні, якія робяць замах на жыццё чалавека; цяжкія, менш цяжкія і лёгкія цялесныя калечанні, пабоі і катаванні, якія робяць замах на здароўе чалавека; злачынствы, што ставяць у небяспеку жыццё і здароўе чалавека (незаконны аборт, пакіданне ў небяспецы, неаказанне дапамогі хвораму і інш.); полавыя злачынствы; злачынствы супраць асабістай свабоды (незаконнае пазбаўленне свабоды, выкраданне або падмен дзіцяці); злачынствы супраць годнасці асобы (паклёп і абраза). У залежнасці ад грамадскай небяспекі З. с. а. крымін. закон прадугледжвае кару ў выглядзе пазбаўлення волі на розныя тэрміны, папраўчых работ, штрафаў. За наўмыснае забойства і згвалтаванне, зробленыя пры абцяжваючых абставінах, злачынца можа быць пакараны смерцю.

Літ.: Дубовец П. А. Ответственность за телесные повреждения по советскому уголовному праву, М., 1964; Горелик И. И. Ответственность за поставление в опасность по советскому уголовному праву, Мн., 1964; Загородников Н. И. Преступления против здоровья, М., 1969.
Э. А. Саркісава. Мінск.

ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАЙ БЯСПЕКІ, ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ І ЗДАРОЎЯ НАСЕЛЬНІЦТВА, грамадска небяспечныя дзеянні, накіраваныя супраць сацыялістычнага правапарадку і здароўя насельніцтва.

Злачынствы супраць грамадскай бяспекі: парушэнне правілаў бяспекі руху і эксплуатацыі аўтамотатранспарту або гарадскога электратранспарту; кіраванне ў п'яным стане транспартнымі сродкамі; парушэнне дзейных на транспарце правілаў; угон аўтамотатранспартных сродкаў; парушэнне правілаў бяспекі горных або буд. работ; парушэнне выт.-тэхн. дысцыпліны або правілаў бяспекі на выбухованебяспечных прадпрыемствах і ў цэхах; парушэнне правілаў хавання, выкарыстання, уліку, перавозкі выбуховых і радыеактыўных рэчываў; незаконнае нашэнне, хаванне, выраб, збыт зброі або выбуховых рэчываў; крадзеж агнястрэльнай зброі, балвых прыпасаў, выбуховых рэчываў; неахайнае хаванне агнястрэльнай зброі; незаконная перасылка лёгкіх на загаранне або атрутных рэчываў і інш. Злачынствы супраць грамадскага парадку: хуліганства; пагроза забіць, прычыніць цяжкія цялесныя калечанні або знішчыць маёмасць; набыццё або збыт маёмасці, здабытай заведама злачынным шляхам; сістэматычнае бадзяжніцтва або папрашайніцтва; залучэнне непаўналетніх да злачыннае дзейнасці; зводніцтва і трыманне прытонаў; замах на асобу і правы грамадзян пад выглядам выканання рэліг. абрадаў; выраб або збыт парнаграфічных прадметаў; здзек з магілы; наўмыснае знішчэнне, разбурэнне, псаванне помнікаў культуры. Злачынствы супраць здароўя насельніцтва: незаконнае лячэнне; парушэнне правілаў, вызначаных для барацьбы з эпідэміямі; забруджванне вадаёмаў і паветра; выраб або збыт атрутных ці наркатычных рэчываў і інш. За ўсе гэтыя злачынствы КК БССР прадугледжвае крымін. адказнасць (арт. 201—225).

Літ.: Матышевский П. С. Ответственность за преступления против общественной безопасности, общественного порядка и здоровья населения, М., 1964; Калмыков В. Т. Ответственность за хулиганство по советскому законодательству, Мн., 1970; Куринов Б. А. Автотранспортные преступления (Квалификация и наказание), М., 1970.
У. С. Шыхуноў. Мінск.

ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАЛІТЫЧНЫХ, ПРАЦОЎНЫХ, ЖЫЛЛЁВЫХ І ІНШЫХ ПРАВОЎ ГРАМАДЗЯН, грамадска небяспечныя дзеянні, накіраваныя супраць канстытуцыйных і інш. правоў і свабод грамадзян.

Злачынствы супраць паліт. правоў грамадзян: перашкода ажыццяўленню выбарчага права, падробка выбарчых дакументаў, няправільны падлік галасоў або парушэнне тайны галасавання, парушэнне правоў прафсаюзаў. Злачынствы супраць прац. правоў грамадзян: парушэнне заканадаўства аб працы; адмаўленне ў прыёме на работу або звальненне цяжарнай жанчыны ці маці, якая корміць дзіця; парушэнне правілаў аховы працы; парушэнне аўтарскіх і вынаходніцкіх правоў. Злачынствы супраць жыллёвых правоў: парушэнне кватэрнай дагэтыкальнасці жылля грамадзян. Злачынствы супраць інш. канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян: парушэнне тайны перапіскі, парушэнне законаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы, перашкода выкананню рэліг. абрадаў. За ўсе гэтыя злачынствы КК БССР прадугледжвае крымін. адказнасць (арт. 130—140).

Літ.: Иванов В. Н. Уголовноправовая охрана осн. прав граждан, М., 1967.
І. І. Гарэлік. Мінск.


ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПРАВАСУДДЗЯ, грамадска небяспечныя дзеянні, накіраваныя супраць правільнай дзейнасці суда, органаў пракуратуры, следства, дазнання, папраўча-працоўных установаў.

Могуць быць зроблены службовымі асобамі (суддзямі, пракурорамі, следчымі): прыцягненне заведама невінаватага да крымін. адказнасці, вынясенне заведама неправасуднага прыгавору, вызначэння або пастановы; заведама незаконны арышт або ўтрыманне; прымус даваць паказанні. З. с. с. п. зыштаваных і засуджаных: уцёкі з месца ссылкі, выволення, з-пад варты або з лячэбна-працоўнага прафілакторыя; самавольнае вяртанне высланага ў месцы, забароненыя яму для пражывання. З. с. с. п. з'яўляюцца таксама заведама ілжывае паказанне; заведама ілжывы данос; адмаўленне або ўхіленне сведкі ці пацярпелага даваць паказанні, эксперта — даваць заключэнне; прымус сведкі ці пацярпелага даваць ілжывыя паказанні або эксперта даваць ілжывае заключэнне, подкуп гэтых асоб; разгалашэнне звестак папярэдняга следства або дазнання; растрата, адчужэнне ці ўтойванне маёмасці, якая апісана або арыштавана; укрывальніцтва злачынстваў; неданясенне пра злачынства. Адказнасць за З. с. с. п. прадугледжваецца арт. 172—186 КК БССР.


Літ.: Власов И. С. и Тяжкова П. М. Ответственность за преступления против правосудия, М., 1968.
У. А. Лабакаў. Мінск.

ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ І АСАБІСТАЙ УЛАСНАСЦІ, грамадска небяспечныя дзеянні, якія прычыняюць маёмасную шкоду дзярж. або грамадскім арг-цыям ці грамадзянам.

Крымін. заканадаўства (арт. 87—99 і 141—148 КК БССР) прадугледжвае адказнасць за крадзеж, грабеж, разбой, махлярства, вымаганне, знішчэнне ці пашкоджанне сацыялісц. і асабістай уласнасці. Акрамя таго, караюцца ў крымін. парадку раскраданне дзярж. або грамадскай маёмасці праз прысваенне дзярж. або грамадскай маёмасці праз прыданне, растрату, злоўжыванне службовым становішчам, прычыненне маёмаснай шкоды дзярж. або грамадскай арг-цыі праз падман, злоўжыванне даверам, прысваенне знойдзенай дзярж. або грамадскай каштоўнай маёмасці, злачыннанядбайнае выкарыстанне або захаванне с.-г. тэхнікі, нядобрасумленныя адносіны асобы, якой даручана ахова дзярж. або грамадскай маёмасці, да сваіх абавязкаў, што выклікала раскраданне, пашкоджанне або гібель гэтай маёмасці ў вялікіх памерах. КК БССР прадугледжвае адказнасць за злачынствы супраць дзярж. або грамадскай маёмасці інш. сацыялісц. дзяржаў, калі гэтая маёмасць знаходзіцца на тэр.




ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АМЕРЫКІ, эканамічная карта



1 — Аляска, 2 — Гавайскія астравы, 3 — Гранд-Рапідс, 4 — Лансінг, 5 — Олбані — Скенектады — Трой, 6 — Спрынгфілд — Холіок, 7 — Сідар-Рапідс, 8 — Рокфард, 9 — Расін, 10 — Саўт-Бенд, 11 — Батл-Крык, 12 — Эдэрсбург, 13 — Ан-Арбар, 14 — Ларэйн — Элірыя, 15 — Янгстаўн — Уорэн, 16 — Джонстаўн, 17 — Рэдынг, 18 — Пітсбург, 19 — Ланкастэр, 20 — Уілкс-Барэ, 21 — Алентаўн — Бетлехем — Істан, 22 — Уілмінгтан, 23 — Пітсбург, 24 — Спрынгфілд, 25 — Гамільтан — Мідлтаўн, 26 — Цынцынаці, 27 — Сцюбенвіл — Уіртан, 28 — Шамберы, 29 — Гастонія, 30 — Канапаліс, 31 — Спартанберг, 32 — Рок-Хіл; на ўрэзцы: 1 — Лорэнс — Лавінсі, 2 — Бостан, 3 — Брокгэм, 4 — Провідэнс, 5 — Нью-Бедфард, 6 — Нью-Брытэн, 7 — Уотэрбэры, 8 — Стамфард, 9 — Трэнтан, 10 — Філадэльфія, 11 — Нью-Лондан — Гротан, 12 — Брыджпарт, 13 — Нью-Хэйвен

Карта складзена і аформлена ў жніўні 1971 г.
Павялічана да аднаго 15,2 × 1971 г.



БССР, а таксама супраць уласнасці несацыялісг. арг-цый (напр., царквы).

Літ.: Кригер Г. А. Борьба с хищениями социалистического имущества, М., 1965; Сирота С. И. Преступления против социалистической собственности и борьба с ними, Воронеж, 1968; Владимиров В. А. Квалификация преступлений против личной собственности, М., 1968.

І. С. Цішкевіч. Мінск.

ЗЛІТАК, маса зацвярдзелага металу пэўнай формы (трапецападобнай, прамавугольнай, круглай, шматгранней), атрыманая крышталізацыяй металу ва ўліўніцах ці спосабам бесперапыннай разліўкі, электролізам, спяканнем метал. парашкоў.

З. з'яўляецца паўфабрыкатам, прызначаным для наступнай пераплаўкі, апрацоўкі ціскам, электралізу і інш. З. важаць ад некалькіх грамаў (З. каштоўных металаў) да 250 *т* (стальныя З.).

ЗЛІЧЭННЕ (нумарацыя), сукупнасць прыёмаў абазначэння (запісу) і назвы лікаў. У большасці сістэм злічэння (СЗ) лікі абазначаюць у выглядзе паслядоўнасці лічбаў.

СЗ падзяляюцца на пазіцыйныя (ПСЗ) і непазіцыйныя (НПСЗ) у залежнасці ад таго, зменьваецца ці не значэнне лічбаў пры змене іх месца (пазіцыі) у паслядоўнасці. Прыклад НПСЗ — т. зв. рымская сістэма, у якой кожны лік запісваецца камбінацыяй сімвалаў з наборам асн. знакаў — *рымскіх лічбаў*. Больш дасканалыя сістэмы — ПСЗ. Першая з вядомых ПСЗ — шасцідзесяцярычная вавілонская СЗ — узнікла каля 4 тыс. гадоў назад і ўжываецца пры вымярэнні і запісе вуглоў і часу. ПСЗ даюць магчымасць запісваць усякі лік з дапамогай невялікай колькасці лічбаў і забяспечваюць прастату выканання арыфм. дзеянняў па табліцах складання і множання. Колькасць *Р* розных лічбаў, якія дапускаюцца пэўнай ПСЗ, наз. асновай СЗ. Асновай могуць быць любыя цэлыя лікі. Калі *Р*=2 (г. зн. для запісу лікаў выкарыстоўваюцца толькі дзве лічбы 0 і 1), то СЗ наз. дваічнай, калі *Р*=10 — дзесятковай. У любой ПСЗ лік *А* выражаецца сумай ступеняў асновы *Р* з каэфіцыентамі, якія могуць прымаць значэнні ад 0 да *Р*−1. Напр., $A_{10}=8034{,}25=8\cdot10^3+0\cdot10^2+3\cdot10^1+4\cdot10^0+2\cdot10^{-1}+5\cdot10^{-2}$. У агульным выпадку $A_p=a_na_{n-1}\ldots a_0,a_{-1}\ldots a_{-m}=a_np^n+a_{n-1}p^{n-1}+\ldots+a_1p^1+a_0p^0+a_{-1}p^{-1}+\ldots+a_{-m}p^{-m}$. Існуюць простыя правілы пераводу лікаў з адной ПСЗ у другую. Гл. таксама *Дваічная сістэма злічэння, Дзесятковая сістэма злічэння, Лічбы.*

Літ.: Фомин С. В. Система счисления, М., 1968.

М. А. Лепяшынскі. Мінск.

ЗЛО, гл. *Дабро і зло.*

ЗЛОБІН Сцяпан Паўлавіч [н. 11(24).11.1903, Масква — 15.9.1965], рускі савецкі пісьменнік. Скончыў Вышэйшы літ.-маст. ін-т імя Брусава (1924). Удзельнік Айч. вайны. Друкавацца пачаў у 1924. У гістар. раманах пра нар. рух 17—18 ст. («Салават Юлаеў», 1929, перапрацаваныя выд. 1941, 1953; «Востраў Буян», 1948; «Сцяпан Разін», 1951, Дзярж. прэмія СССР 1952) паказаў еднасць народаў Расіі ў барацьбе за свабоду, шырока выкарыстаў нар. песні, паданні, легенды. Аўтар рамана пра барацьбу сав. людзей у лагерах ваенна-паланонных «Прапалі без вестак» (ч. 1—4, 1962).

Тв.: По обрывистому пути, М., 1967; бел. пер.— Салават Юлаеў, Мн., 1933.

Літ.: Кудряшова Е. И. Степан Злобин как автор исторических романов. Критико-биогр. очерк, Белгород, 1961.

ЗЛОТНІК Эфраім Ісакавіч (н. 18.3.1919, Гомель), беларускі савецкі вучоны ў галіне пейрахірургіі. Д-р мед. н. (1958), праф. (1963). Скончыў 1-ы Харкаўскі мед. ін-т (1941). Удзельнік Айч. вайны (1941—44). Працаваў у Мінскім мед. ін-це (1945—47). З 1949 кіраўнік пейрахірург. адда. Бел. НДІ неўралогіі, пейрахірургіі і фізіятэрапіі. Асн. працы ў галіне сасудзістай нейрахірургіі.

Тв.: Гемостаз и управляемая артериальная гипотония в мозговой хирургии, Мн., 1965; Аневризмы сосудов головного мозга, Мн., 1967; (разам з В. С. Маятам, Г. Я. Востраверхавым і М. К. Багалепавым) Хирургия сонных артерий, М., 1968; (разам з І. А. Склютам) Невриномы слухового нерва, Мн., 1970.

ЗЛОТЫ (польск. złoty, złotówka), грашовалікавая адзінка Вял. кн. Літ. і Рэчы Паспалітай, грашовая адзінка Царства Польскага, бурж. Польшчы, ПНР.

У 14—15 ст. назва залатога дуката і фларына, з 2-й пал. 15 ст. грашова-лікавая адзінка. З. польскі быў роўны палове капы (капа=60 грошам). Як рэальная срэбраная манета ўпершыню выпушчана ў 1564 *Віленскім манетным дваром* у выглядзе талера з лічбай XXX (30 грошаў), у 1620—22 чаканіліся срэбраныя З., у 1661—66 срэбраныя польскія і літоўскія З. Рэгулярная эмісія З. пачалася з 1766. У 1794 па ініцыятыве Т. Касцюшкі ўпершыню выпушчаны папяровыя асігнацыі 1; 4; 5; 10; 25; 50; 100; 500; 1000 З. У Царстве Польскім, якое ўваходзіла ў склад Расіі, Варшаўскі манетны двор выпускаў срэбраныя З. (1818—34), двайныя З. (1816—30), 5 З. (1816—34), 10 З. (1820—27), залатыя 25 З. (1817—33), 50 З. (1817—29) з надпісамі на польскай мове. У час паўстання 1830—31 чаканіліся т. зв. мяцежныя манеты вартасцю 1; 2; 5 З. У 1832—50 адначасова ў Варшаве і Пецярбурзе на польск. і рус. мовах выпускаліся срэбраныя манеты: 1 З. (15 кап.), 2 З. (30 кап.), 5 З. (75 кап.), 10 З. (1,5 руб.) і залатыя 20 З. (3 руб.). У канцы 19 — пач. 20 ст. на Беларусі З. (залатоўка) — народная назва 15-капеечнай манеты. У бурж. Польшчы грашовая адзінка (1924—39), якая падзялялася на 100 грошаў, чаканіліся нікелевы 1 З., срэбраныя 2; 5; 10 З., залатыя 20; 25; 50; 100 З. Асн. грашовая адзінка ПНР, якая падзяляецца на 100 грошаў; выпускаюцца манеты 1; 2; 5; 10 З., банкноты 20; 50; 100 і 500 З. Паводле курсу Дзяржбанка СССР на студз. 1971 100 З.=22 руб. 50 кап.

Літ.: Рябцевич В. Н. О чем рассказывают монеты, Мн., 1968; Kiersnowski R. Wstęp do numizmatyki polskiej wieków średnich, Warszawa 1964; Gumowski M. Podręcznik numizmatyki polskiej, Kraków, 1914.

В. Н. Рабцэвіч. Мінск.

ЗЛУЧАЛЬНАЯ ТКАНКА, тканка арганізмаў жывёл і чалавека, якая складаецца з клетак і міжклетачнага рэчыва і ўтварае ўнутранае асяроддзе арганізма. У ніжэйшых жывёл гэта амёбаідна-рухальныя клеткі, якія пераносяць пажыўныя рэчывы ў арганізме. У чалавека і ў вышэйшых жывёл ёсць ва ўсіх органах і ў залежнасці ад функцыі мае розную будову. Развіваецца з мезенхімы. Стан і функцыі яе рэгулююцца нервовымі і гумаральнымі механізмамі. Функцыі З. т.: механічная (утварае шкілет, абалонкі і апору ўнутраных органаў, злучае органы), трафічная (пераносіць пажыўныя і інш. рэчывы да парэнхімы і ад адных органаў да другіх), ахоўная (ажыццяўляе ахоўныя запаленчыя рэакцыі арганізма, гл. *Імунітэт, Фагацытоз*), пластычная (удзельнічае ў рэгенерацыі, запаўняе дэфекты пры пашкоджанні органаў).

Паводле будовы З. т. падзяляюць на касцявую, храстковую, рэтыкулярную (складае аснову крывятворных органаў), тлушчавую і вельмі пашыраную валакністую, якая пранізвае ўсе органы і ўтварае праслойкі паміж асобнымі органамі. У міжклетачным рэчыве валакністай З. т. ёсць валокны калагенавыя (моцныя, не расцягваюцца, пры кіпячэнні ўтвараюць клейкую масу), эластычныя і ра-

тыкулінавыя (перапляцтаюцца, утвараюць сетку). Прамежкі паміж валокнамі і клеткамі запоўнены студзінападобным рэчывам, вязкасць якога, а ў выніку *турэар* З. т. і ля пранікальнасць залежаць ад колькасці і ступені палімерызацыі мукаполіцукрыдаў (гіялуронавай к-ты, гепарыну і інш.), што ўваходзяць у яе састаў. Клеткі З. т.: камбіяльныя, фібрабласты, гістыяцыты (здольныя ператварацца ў ахоўныя клеткі-мікрафагі), плазматычныя, пігментныя, тлушчавыя і інш.

Літ.: Елисеев В. Г. Соединительная ткань, М., 1961; Соединительная ткань в норме и патологии, Новосибирск, 1968; Фукс Б. Б. и Фукс Б. И. Очерки морфологии и гистохимии соединительной ткани, Л., 1968; Заварзин А. А. Очерки эволюционной гистологии крови и соединительной ткани, в. 1—2, М.— Л., 1945—47.

А. В. Пішчыкі. Мінск.

ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ АМЕРЫКІ, ЗША (United States of America), дзяржава ў Паўн. Амерыцы. Пл. 9364 тыс. км², нас. 204,7 млн. чал. (1970). Сталіца Вашынгтон. Падзяляецца на 50 штатаў і адну федэральную (сталічную) акругу Калумбія, якія па тэр. прыкметах складаюць 9 груп. Гістарычна склаўся падзел ЗША на тры гал. раёны: Поўнач, Поўдзень і Захад. (Адм. падзел ЗША ў табл. 1, гл. таксама арт. пра кожны штат.)




ЗША — калан. дзяржава. Пад яе кантролем Пуэрта-Рыка (2750 тыс. ж., 1968) і Віргінскія а-вы (50 тыс. ж.) у Карыбскім моры, Усх. Самоа (28 тыс. ж.), Гуам (80 тыс. ж.) і інш. Пад часовай апекай Каралінскія, Марыянскія і Маршалавы а-вы (97 тыс. ж.); з 1903 ЗША арандуюць у Панамы зону Панамскага канала. Іл. і карты гл. па ўклейках.

Дзяржаўны лад. ЗША — федэратыўная рэспубліка. Дзейнічае канстытуцыя 1787 (набыла сілу ў 1789); у 1791—1967 да яе прынята 25 паправак. На чале дзяржавы і ўрада прэзідэнт. Выбіраецца двухступеньчатымі выбарамі на 4 гады. Мае шырокія паўнамоцтвы: права вета на рашэнні кангрэсу; права выдаваць загады, якія маюць абавязковую сілу. Узначальвае кабінет міністраў (сакратароў), якіх назначае фармальна са згоды сената; галоўнакамандуючы арміі і флоту. Вышэйшая заканадаўчая ўлада належыць кангрэсу, які складаецца з палаты прадстаўнікоў і сената. Палата прадстаўнікоў выбіраецца насельніцтвам прамымі выбарамі на 2 гады. Сенат — орган прадстаўніцтва штатаў (выбіраецца па 2 сенатары ад кожнага штата на 6 гадоў), кожныя 2 гады абнаўляецца на $^1/_3$. Правы сената значна шырэйшыя за правы палаты прадстаўнікоў (ратыфікуе міжнар. дагаворы, якія заключаюцца прэзідэнтам, зацвярджае назначэнні на важныя дзярж. пасады). Старшыня сената — віцэ-прэзідэнт. Урад (кабінет міністраў) складаецца з 12 міністраў (сакратароў). Найважнейшыя пытанні ў краіне (асабліва знешняй палітыкі) вырашае Савет нац. бяспекі, у які ўваходзяць прэзідэнт, віцэ-прэзідэнт, дзярж. сакратар, міністр абароны, дырэктар управлення надзвычайнай гатоўнасці. Савету нац. бяспекі падпарадкоўваецца Цэнтр. разведвальнае ўпраўленне (ЦРУ). Кожны штат мае сваю канстытуцыю, заканадаўчы орган (звычайна двухпалатны), узначальваецца губернатарам, які выбіраецца на 2—4 гады. Суд. сістэма: Вярх. суд ЗША (складаецца з 9 суддзяў, якія назначаюцца прэзідэнтам пажыццёва са згоды сената), федэральныя акруговыя, апеляцыйныя і суды штатаў.

Прырода. Паверхня ЗША падзяляецца на 2 часткі: сярэднюю і ўсх.— раўнінную з невысокімі гарамі і зах.— горную. На У і ПдУ — плоскія нізіны: Прыатлантычная з п-вам Фларыда і Прымексіканская. На З ад Прыатлантычнай нізіны з ПнУ на ПдЗ цягнуцца старажытныя (палеазойскія), моцна разбураныя горы *Апалачы*. Тэр. паміж Кардыльерамі і Апалачамі займаюць Цэнтр. раўніны выш. 200—300 *м* і Вялікія раўніны выш. 500—1700 *м* над узр. м. На мяжы паміж Цэнтр. раўнінамі і Прымексіканскай нізінай — невысокія плато Озарк (выш. 540 *м*) і горы Уошыта (884 *м*). Зах. частка ЗША і штат *Аляска* заняты горнай сістэмай *Кардыльераў*. На У — вулканічныя Каскадныя горы і хрыбет Сьера-Невада выш. 4418 *м* (г. Уітні). Ціхаакіянскае ўзбярэжжа занята маладымі Берагавымі хрыбтамі альпійскай складкавасці выш. да 2529 *м*. На крайнім ПдЗ ЗША частыя землетрасенні. Карысныя выкапні: вугаль (прамысл. запасы 140 млрд. *т*, 1966) — басейны Пенсільванскі ў перадгорным прагіне Апалачаў, Іліной скі на Пд ад Вялікіх азёраў, Заходні ў бас. р. Місісіпі, Уошыта, невялікія радовішчы ў Кардыльерах; нафта (4,8 млрд. *т*, 1965) і прыродны газ (8,1 тыс. млрд. м³, 1965) у штатах Тэхас, Канзас, Аклахома, Каліфорнія і на Аляскы; жал. руды (5,5 млрд. *т*, 1966) у р-не Вялікіх азёраў, у Апалачах; уранавыя руды (178 тыс. *т*, 1966) у штатах Нью-Мексіка, Каларада, Юта, Айдаха, Ваёмінг, Вашынгтон і Фларыда. Значныя запасы серы і спажыўной солі на ўзбярэжжы Мексіканскага заліва; фасфарытаў — на п-ве Фларыда; у Кардыльерах і на Аляскы — многіх каляровых, рэдкіх металаў і золата. Трапляюцца ў невялікай колькасці свінец, нікель, серабро і волава, хромавыя, марганцавыя і інш. руды.

Штат Каларада. Горад Каларада-Спрынгс у Скалістых гарах.



Тэрыторыя ўласна ЗША знаходзіцца ва ўмераным і субтрапічным пасах, а умоўная мяжа па 40° паўн. шыр., паўд. частка Фларыды — у трапічным поясе, Аляска — у арктычным і субарктычным. У межах большай часткі краіны клімат кантынентальны, на ўзбярэжжы Ціхага ак. і на ПдУ — акіянічны. Сярэдняя т-ра студз. ад −16 да −18 °С на Пн Цэнтр. раўнін і ад 12 на ПдЗ да 20 °С на п-ве Фларыда; ліп. 16 на З і ад 20 да 26 °С на У; на п-ве Фларыда і ў Каліфарнійскай даліне ад 22 да 28 °С. На ўнутр. плато Кардыльераў т-ра дасягае 40 °С (у Даліне Смерці 56,7 °С, найвыш. т-ра Зах. паўшар'я). Ападкаў 1200—1500 *мм* на ПнЗ і ПдУ і 400—700 *мм* у цэнтр. частках краіны, на плато Кардыльераў — ад 200 да 500 *мм* за год. Максімум ападкаў (6000 *мм* за год) выпадае на зах. схілах Каскадных гор, а мінімум (100 *мм* за год) у пустынях на нізінным цячэнні р. Каларада. Найб. рака ЗША — Місісіпі з прытокамі Місуры, Арканзас, Рэд-Рывер, Агайо і інш. Рэкі Кардыльераў (Калумбія з Снэйкам, Каларада) маюць горны характар, са значнымі запасамі гідраэнергіі. У засушлівых абласцях Вялікага басейна рэкі кароткія, паўнаводныя толькі зімою. Рэкі Прыатлантычных раўнін кароткія, паўнаводныя, у нізінным цячэнні суднаходныя. На Аляскы найб. рака *Юкан*. Сярод азёраў вылучаецца сістэма *Вялікіх азёраў* ледавікова-тэктанічнага паходжання. Пад лесам 38% тэр. краіны. Размяшчэнне глебавараслінных зон вызначаецца змяненнем колькасці цяпла з Пн на Пд і сухасці з У на З. На ПнУ краіны і ў р-не Вялікіх азёраў — хваёва-шыракалістыя лясы на дзярнова-падзолістых глебах, у сярэдняй частцы Прыатлантычнай нізіны і ў паўд. Апалачах — шыракалістыя лясы. Пд Місісіпскай і Прыатлантычнай нізін, а таксама Пн п-ва Фларыда заняты субтрапічнымі вечназялёнымі лясамі на чарназёмах. На З ад Місісіпі да 100° зах. даўг.— высакатраўныя прэрыі. На Вялікіх раўнінах прэрыі пераходзяць у сухія стэпы з чарназёмнымі, каштанавымі і карычневымі глебамі. Упутраныя плато і пласкагор'і заняты сухімі стэпамі, палупустынямі і шэразёмамі і бурымі глебамі, якія на Пд ЗША пераходзяць у хмызняковыя пустыні. На Ціхаакіянскім узбярэжжы раслінасць змяняецца ад хваёвых лясоў на Пн да сухалюбівага хмызняку (чапараль) на Пд. Пад лясамі — горныя бурыя лясныя глебы, над хмызнякамі горныя карычневыя і горныя шэра-карычневыя. Жывёльны свет мае многа агульных рысаў з Еўропай і Азіяй, найлепш захаваўся на Аляскы, у запаведніках і нац. парках. У краіне 35 нац. паркаў і запаведнікаў агульнай пл. каля 80 тыс. км². Найб. з іх: Пелаўстонскі (8963 км²) і Маўнт-Мак-Кінлі (7759 км²), Эверглейдс (4913 км²), Глейтэр (4052 км²), Алімпік (3586 км²) нац. паркі; запаведнікі Катмай (10 790 км²) і Глейшэр-Бей (9198 км²).


Табліца 1

Адміністрацыйны падзел ЗША, плошча і насельніцтва штатаў на 1969

Назва штатаў	Плошча, тыс. км²	Насельніцтва, тыс. чал. (ацэнка)	Назва штатаў	Плошча, тыс. км²	Насельніцтва, тыс. чал. (ацэнка)
Штаты Новай Англіі			Зах. Віргінія	62,6	1819
	24,9	439	Калумбія (акруга)	0,2	798
Вермонт	12,9	3000	Мэрыленд	27,4	3765
Канектыкут	21,5	5467	Паўд. Караліна	80,4	2692
Масачусетс	86,0	978	Паўн. Караліна	136,6	5205
Мэн			Фларыда	151,7	6354
Нью-Гэмпшыр	24,1	717	Центр. штаты Паўднёвага Усходу		
Род-Айленд	3,2	911			
Сярэдне-Атлантычныя штаты			Алабама	133,7	3531
			Кентукі	104,6	3232
Нью-Джэрсі	20,3	7148	Місісіпі	123,6	2360
Нью-Йорк	128,4	18 321	Тэнесі	109,4	3985
Пенсільванія	117,4	11 803	Центр. штаты Паўднёвага Захаду		
Центр. штаты Паўночнага Усходу					
			Аклахома	181,1	2568
Агайо	106,7	10 740	Арканзас	137,5	1995
Вісконсін	145,4	4233	Луізіяна	125,7	3745
Іліной с	146,1	11 047	Тэхас	692,1	11 187
Індыяна	94,1	5118			
Мічыган	150,8	8766	Горныя штаты		
Центр. штаты Паўночнага Захаду			Айдаха	216,4	718
			Арызона	295,0	1693
Аява	145,8	2781	Вайоминг	253,6	320
Канзас	213,1	2321	Каларада	269,9	2100
Мінесота	217,8	3700	Мантана	381,1	694
Місуры	180,4	4651	Невада	286,3	457
Небраска	200,0	1449	Нью-Мексіка	315,1	994
Паўд. Дакота	199,5	659	Юта	219,9	1045
Паўн. Дакота	183,1	615	Ціхаакіянскія штаты		
Паўд.-Атлантычныя штаты			Арэгон	251,2	2032
			Аляска	1519,0	282
Віргінія	105,7	4669	Вашынгтон	176,6	3402
Джорджыя	152,6	4641	Гавай	16,7	794
Дэлавэр	5,3	540	Каліфорнія	411,0	19 443

Насельніцтва. Большасць — амерыканцы, нацыя, якая ўтварылася ад змяшання патомкаў перасяленцаў з краін Еўропы (гл. *Народы Амерыкі*). У 18—19 ст. завезена з Афрыкі каля 1 млн. неграў-рабоў. Патомкі іх (23 млн. чал., 1970) складаюць этнагр. групу амер. нацыі. Карэннае насельніцтва — індзейцы (500 тыс. чал., 1970). Большасць іх знішчана ў час каланізацыі. Нац. меншасці (эскімосы, індзейцы, пуэртарыканцы), а таксама выхадцы з краін Афрыкі і Азіі церпяць жорсткую расавую дыскрымінацыю. Дзярж. мова ЗША англійская, але адрозніваецца асаблівасцямі вымаўлення і слоўнікавага складу. Большасць веруючых — пратэстанты і католікі, ёсць праваслаўныя, іудаісты і інш. Сярэдняя шчыльн. нас. 22 чал. на 1 км², у штатах ПнУ — 100, у горных штатах — 3,5, на Аляскы — 0,2. Гарадскога нас. больш за 70%. Вял. гарады (з прыгарадамі, млн. чал., 1970): Нью-Йорк 16, Лос-Анджэлес 7, Чыкага 6,9, Філадэльфія 4,8, Дэтройт 4,2, Сан-Францыска 3,1.

Гістарычны нарыс. Да адкрыцця Паўн. Амерыкі Х. Калумбам (1492) тэр. насялялі індзейскія плямёны і эскімосы. Карэннае нас. займалася паляваннем, рыбнай лоўляй, прымітыўным земляробствам. Індзейцаў да 16 ст. было каля 1 млн. чал. З 16 ст. Іспанія, Францыя, Англія, Нідэрланды, Швецыя пачалі каланізацыю краіны. У 18 ст. рускія адкрылі і сталі асвойваць Аляску. У 1607 Англія заснавала ў Амерыцы (Віргінія) першае паселенне, а ў 18 ст. мела там 13 калоній з насельніцтвам амаль 2,6 млн. чал. Каланізацыя суправаджалася выцясненнем і вынішчэннем індзейцаў. У паўн. калоніях (т. зв. Новай Англіі) развіваліся пераважна рамяство і мануфактурная прамысловасць, у цэнтр.— фермерская вытворчасць, на поўдні — буйная плантацыйная гаспадарка з выкарыстаннем рабскай працы белых і неграў. Рабства неграў было пажыццёвае і спадчыннае. Паступова яно выцясніла сістэму закантрактаванай працы. Каб ператварыць амер. калоніі ў пастаўшчыкоў сыравіны і ў рынкі збыту, Англія ўвяла для іх прамысл. і гандл. абмежаванні (забараніла выплаўку сталі, многія віды прамысл. прадпрыемстваў, продаж асноўнай калан. прадукцыі іншым краінам і г. д.). Нягледзячы на гэта, капіталіст.





Штат Ілінойс. Горад Чыкага (злева). Штат Нью-Мексіка. Сушка чырвонага стручковага перцу.

адносіны развіваліся, фарміравалася новая бурж. паўн.-амер. нацыя. Супярэчнасці паміж інтарэсамі амер. буржуазіі і палітыкай метраполіі перараслі ў *вайну за незалежнасць у Паўночнай Амерыцы 1775—83*, якая скончылася перамогай амерыканцаў і стварэннем ЗША. Вынікі вайны скарысталі пераважна буржуазія і плантатары. Іх панаванне замацавала прынятая ў 1787 (пачала дзейнічаць у 1789) канстытуцыя ЗША. У 1791 пад націскам нар. мас у яе ўнесены першыя 10 папраўак пра бурж.-дэмакр. свабоды (гл. *«Біль аб правах»*). Першым прэзідэнтам ЗША стаў Дж. *Вашынгтон* [1789—97]. У пач. 19 ст. тэр. краіны значна павялічылася. У 1803 ЗША купілі ў Францыі Зах. Луізіяну. У 1819 прымусілі Іспанію прадаць фактычна захопленую ўжо амерыканцамі Фларыду. Пануючыя колы ЗША імкнуліся захапіць англ. калонію Канаду. Англія са свайго боку спадзявалася падарваць суверэнітэт ЗША. Англа-амер. вайна 1812—14, выкліканая гэтымі прычынамі, умацавала незалежнасць ЗША.

У пач. 19 ст. ў ЗША пачаўся прамысл. пераварот. З 1820 да 1860 іх удзельная вага ў сусв. вытворчасці вырасла з 6 да 15%. Прамысл. рэвалюцыя ахапіла пераважна старыя, паўн.-ўсх. штаты. На Пд умацавалася плантацыйная рабаўладальніцкая гасп. З 1792 да 1859 колькасць рабоў павялічылася з 0,7 да 4 млн. чал. Паміж Пн і Пд ішла барацьба за т. зв. свабодныя землі Захаду. У 1820 дасягнуты «Місурыйскі кампраміс», які забараніў рабства на Пн ад 36°30′ паўн. ш. Дактрына Манро (1823) абвясціла лозунг «Амерыка для амерыканцаў» і сведчыла пра імкненне ЗША да экспансіі ў Лац. Амерыцы. У выніку *амерыкана-мексіканскай вайны 1846—48* ЗША далучылі большую частку тэр. Мексікі. У 1867 купілі ў Расіі за 7,2 млн. дол. Аляску. На 1860 тэр. ЗША павялічылася да 2 973 905 кв. міль, нас. да 31,4 млн. чал. На сярэдзіну 19 ст. супярэчнасці паміж Пн і Пд надзвычай абвастрыліся. Быў парушаны «Місурыйскі кампраміс», рабства стала пашырацца на Пн. Сістэма рабаўладання тармазіла сац.-эканам. прагрэс ЗША. Рух супраць яе ў 30-л — 50-я г. 19 ст. стаў масавы (гл. *Абаліцыянізм*). Паўстанне Джона *Браўна* 1859 абвастрыла становішча ў краіне. У 1861 пачалася грамада. вайна (гл. *Грамадзянская вайна ў ЗША 1861—65 і рэканструкцыя Поўдня* 1865—77). У выніку вайны ліквідаваны інстытут рабства, створаны ўмовы для хуткага развіцця капіталізму і індустрыялізацыі ЗША. У 90-л г. 19 ст. ЗША выйшлі на 1-е месца ў свеце па аб'ёме прамысл. прадукцыі. Узмацнілася эксплуатацыя рабочага класа. Асабліва цяжкае было становішча рабочых-імігрантаў і неграў. Дыскрымінацыйныя законы плантатараў Пд («Чорныя кодэксы») пазбаўлялі неграў элементарных правоў. Барацьба рабочых за паляпшэнне свайго становішча ў апошняй чвэрці 19 ст. стала арганізаванай (вабастоўкі 1877, 1886—87, 1894 і інш.). У 1869 засн. прафс. аб'яднанне пераважна некваліфікаваных рабочых — Ордэн рыцараў працы; у 1881 — аб'яднанне кваліфікаваных рабочых па цэхавай адзнацы — Амерыканская федэрацыя працы (АФП). Сацыяліст. рух у ЗША пачаўся з узнікненнем (1867) секцый I Інтэрнацыянала. Вялікая роля ў прапагандзе марксізма належала ням. імігрантам І. *Вейдэмееру* і Ф. *Зорге*.

Пераход капіталізму (з канца 19 ст.) у імперыялізм, стадыю характарызаваўся ў ЗША асабліва інтэнсіўнай канцэнтрацыяй вытворчасці і капіталу. Пашыралася ўлада манаполій. Усё больш выяўляўся іх драпежніцкі характар, імкненне да сусв. панавання. У іспана-амер. вайну 1898 ЗША захапілі Філіпінскія, Пуэрта-Рыка і Гуам а-вы, устанавілі пратэктарат над Кубай. З дапамогай *«адчыненых дзвярэй»* дактрыны імкнуліся заняволіць Кітай. Амер. войскі ўдзельнічалі (1900—01) у разгроме нар. паўстання ў Кітаі. Пад прыкрыццём дактрыны Манро ЗША прэтэндавалі на манапольнае панаванне ў Лац. Амерыцы, у 1903 захапілі частку Панамы (гл. *Амерыкана-панамскія дагаворы*), да 1914 пабудавалі канал і заняволілі ўсю краіну. Пад выглядам абароны агульных інтарэсаў амер. дзяржаў урад ЗША садзейнічаў стварэнню ў 1889 «Міжнар. бюро амер. рэспублік» (з 1910 Панамерыканскі саюз, які стаў сродкам ЗША для паліт. і эканам. ўздзеяння на амер. краіны). ЗША ўзялі на сябе функцыі «міжнар. паліцэйскай сілы» да лацінаамер. дзяржаў. Войскі ЗША акупавалі Кубу (1899—1902, 1906—09), Нікарагуа (1912—33), Гаіці (1915—34), Дамініканскую Рэспубліку (1916—24). У 1914 і ў 1916—17 арганізаваны інтэрвенцыі ў Мексіку, у 1917—22 на Кубу. Абвастрэнне класавай барацьбы прымушала буржуазію разам з паліт. рэпрэсіямі ісці на манеўры. У 1890 быў прыняты закон Шэрмана, паводле якога вяліся судовыя працэсы супраць трэстаў. Працэсы скончыліся спагнаннем з карпаратыўных нязначных штрафаў, а распушчаныя трэсты неўзабаве былі адноўлены пад новай назвай. На пачатку 1-й сусв. вайны 1914—18 ЗША прытрымліваліся нейтралітэту. Амер. манаполіі атрымалі велізарныя прыбыткі на ваен. пастаўках, далі краінам Антанты шматмільённыя крэдыты і пазыкі. Баючыся аслаблення сваіх эканам. і паліт. пазіцый у выпадку перамогі Германіі, адносіны з якой усё больш абвастраліся, ЗША 6.4.1917 пачалі ваен. дзеянні супраць Германіі.

Вял. Кастр. сацыяліст. рэв. зрабіла вялікі рэвалюцыянізуючы ўплыў на ЗША. Ва ўмовах росту масавага рабочага руху ў 1919 засн. *Камуністычная партыя Злучаных Штатаў Амерыкі* (КП ЗША). Пануючыя колы ЗША разглядалі перамогу пралетарыяту Расіі як пагрозу капіталіст. ладу ў сваёй краіне і ва ўсім свеце. Разам з Англіяй і Францыяй ЗША ўдзельнічалі ў арганізацыі і ажыццяўленні міжнар. антысавецкай інтэрвенцыі. Амер. войскі самавольнічалі на Поўначы (1918—19) і на Д. Усходзе (1918—20) Сав. Расіі (гл. ў арт. *Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя ў СССР 1918—20*). Антысав. палітыка ўрада В. Вільсана [1913—21] выклікала пратэст амер. мас. Былі створаны «Ліга сяброў Савецкай Расіі» і к-ты «Рукі прэч ад Расіі». Поспехі Чырв. Арміі і шырокая кампанія пратэсту супраць удзелу ЗША ў антысав. інтэрвенцыі прымусілі амер. ўрад адклікаць (1920) свае войскі з тэрыторыі Савецкай рэспублікі.

У выніку 1-й сусв. вайны ЗША значна ўмацавалі сваю эканоміку. Вырасла іх роля ў капіталіст. свеце. Узмацнілася знешнепаліт. экспансія. У жн. 1921 ЗША падпісалі з Германіяй сепаратны мірны дагавор, у якім былі ўсе палажэнні *Версальскага мірнага дагавору 1919*, выключаючы тэкст статута Лігі Нацый. На *Вашынгтонскай канферэнцыі 1921—22* ЗША дамагліся ўмацавання сваіх пазіцый у Кітаі і ў бас. Ціхага ак. Распрацаваны ў 1923—24 па ініцыятыве ЗША рэпарацыйны план для Германіі (гл. *Дауэса план*) павінен быў спрыяць адраджэнню герм. мілітарызму як сілы, накіраванай супраць СССР, і ўстанаўленню фактычнага кантролю ЗША над эканомікай Германіі. У перыяд часовай стабілізацыі капіталізму (з 1924) ЗША ўступілі ў палосу адноснага росквіту эканам. крызіс, які ахапіў увесь капіталіст. свет. Да лета 1932 прамысл. вытворчасць у ЗША скарацілася амаль удвая. Ліквідавалася 110 тыс. прамысл. і гандл. прадпрыемстваў, абанкрутавала больш за 5 тыс. банкаў, дзесяткі чыг. кампаній. Зарплата рабочых і прыбыткі фермераў знізіліся амаль на 60%. Крызіс абвастрыў класавыя супярэчнасці ў краіне. У 1931 і 1932 пад кіраўніцтвам КП ЗША адбыліся дэманстрацыі і нац. «галодныя паходы» беспрацоўных у Вашынгтон, у 1933 — нац. канферэнцыі фермераў, якія прынялі рашэнні разам з рабочымі амагацца супраць манаполій. У 1932 прэзідэнтам ЗША выбраны кандыдат засн. у 1828 Дэмакр. партыі Ф. *Рузвельт* (перавыбіраўся ў 1936, 1940, 1944). Яго праграма «новага курсу» прадугледжвала мерапрыемствы па пераадоленні крызісу і ўмацаванні капіталіст. сістэмы праз дзярж. «рэгуляванне» прамысловасці і с. гасп., арганізацыю грамадскіх работ для змяшэння арміі беспрацоўных. Але «новы курс» не спыніў чарговага крызісу 1937. Урад Рузвельта 16.11.1933 устанавіў дыпламат. адносіны з СССР. У жн. 1935 у ЗША прыняты закон аб нейтралітэце, аднак амер. імперыялізм усяляк патураў агрэс. актам фаш. блока, садзейнічаў развязванню 2-й сусв. вайны. У 1939—41 ЗША ўсё больш актыўна падтрымлівалі Францыю і Вялікабрытанію. На іх карысць у ліст. 1939 амер. канграс дазволіў продаж зброі краінам, якія ваявалі. У вер. 1940 у ЗША ўведзена ўсеагульная воінская павіннасць. Пачалося ажыццяўленне шырокай праграмы ўзбраення. 11.3.1941 прыняты закон аб ленд-лізе (перадачы ваен. матэрыялаў у пазыку ці ў арэнду краінам, якія ўдзельнічалі ў вайне супраць Германіі). 24.6.1941 амер. ўрад заявіў пра сваю падтрымку СССР, але закон аб ленд-лізе распаўсюдзіў на Сав. Саюз толькі ў ліст. 1941. Пасля нападу (7.12.1941) яп. авіяцыі і флоту на амер. ваен.-марскую базу Пёрл-Харбар ЗША абвясцілі вайну Японіі. 11 снеж. Германія і Італія абвясцілі вайну ЗША. 11.6.1942 у Вашынгтоне падпісана сав.-амер. пагадненне аб прынцыпах, дастасавальных да ўзаемнай дапамогі ў вайне супраць агрэсіі. Аднак ЗША ўсяляк зацягвалі адкрыццё 2-га фронту ў Еўропе (гл. ў арт. *Другая сусветная вайна 1939—45*). Паліт. і ваен. стратэгія амер. імперыялістаў была накіравана на анясіленне СССР у адзінаборстве з фаш. Германіяй, забеспячэнне спрыяльных умоў для панавання ў пасляваен. свеце. У пач. жн. 1945 амер. ўрад аддаў варварскі загад пра атамную бамбардзіроўку яп. гарадоў Хіросіма (6 жн.) і Нагасакі (9 жн.).

Пасля вайны ЗША сталі гал. сілай сусв. рэакцыі, аднак не вдолелі перашкодзіць перамозе сацыялізма ў многіх краінах Еўропы і Азіі, разгортванню нац.-вызв. руху ва ўсім свеце. Апіраючыся на палітыку сілы, урад Г. Трумэна [1945—53] падтрымаў Чан Кай-шы ў Кітаі, рэакц. рэжымы ў Грэцыі і Турцыі (гл. *Трумэна дактрына*), павязаў шэрагу еўрап. краін план Маршала, а лацінаамер. дзяржавам Міжамерыканскі дагавор аб узаемнай дапамозе (пачаў дзейнічаць у 1948). На аснове панамер. сістэмы ў 1948 створана *Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў*, гал. роля ў якой належыць ЗША. Амер. імперыялізм — ініцыятар стварэння агрэс. блока НАТО (гл. *Арганізацыя Паўночнаатлантычнага дагавору*). Стаўшы на шлях «халоднай вайны» супраць СССР і краін нар. дэмакратыі, ЗША не спыніліся перад адкрытай агрэсіяй 1950—53 супраць КНДР. У вер. 1951 адначасова з сепаратным Сан-Францыскім мірным дагаворам заключылі з Японіяй «дагавор бяспекі», які ўзаконіў права ЗША выкарыстоўваць тэр. Японіі як ваен. плацдарм на Д. Усходзе. Унутр. палітыка пануючых колаў ЗША была накіравана на абарону інтарэсаў манаполій, на барацьбу з рабочым рухам і абмежаванне дэмакр. свабод. Але антырабочы рэакцыйны *Тафта — Хартлі закон* не спыніў забастоўначага руху ў краіне. У 1947—52 адбылося 25 415 стачак, у якіх удзельнічала больш за 15 млн. чал. Жорсткія рэпрэсіі цярпелі прагрэс. сілы. У 1949 засуджаны і кінуты ў турмы кіраўнікі КП ЗША. Урад прыняў антыкамуніст. *Макарэна — Вуда закон* і *Макарэна — Уолтэра закон*. Каля 300 дэмакр. арг-цый былі абвешчаны «падрыўнымі». Адначасова ажыццяўлялася палітыка сегрэгацыі і расавай дыскрымінацыі неграў (судовыя працэсы 1949—50). Расізм і шавінізм сталі афіц. дзярж. ідэалогіяй, гангстэрызм — асн. сродкам расправы з прагрэс. дзеячамі, з рухам працоўных за эканам. і паліт. правы, супраць расавай дыскрымінацыі.

З 50-х г. 20 ст. ЗША ўступілі ў палосу эканам. і паліт. цяжкасцей. Іх удзельная вага ў сусв. капіталіст. прамысл. вытворчасці з 55,8% у 1948 упала да 42,5% у 1970. Удвая скарацілася запасы золата. Прамысл. вытворчасць няраз перажывала сур'ёзныя эканам. крызісы (1948—49, 1953—54, 1957—58, 1960—61, 1969—71). Узмацніліся супярэчнасці паміж ЗША і іх саюзнікамі на ваен. блоках. Пры прэзідэнце Д. Эйзенхаўэры [1953—61] вырас уплыў рэакц. элементаў, *Пентагона*, ЦРУ (гл. *Цэнтральнае разведвальнае ўпраўленне ЗША*) і *Федэральнага бюро расследаванняў*. Прыняты законы, якія абмежавалі дзейнасць прафсаюзаў, ліквідавалі ўсе дэмакр. заваёвы неграў. Пасля забойства прэзідэнта Дж. Кенэдзі (1963) і Р. Кенэдзі (1968) рэакцыя ўзмацніла тэрор супраць дэмакр. сіл. Ваен. інтэрвенцыя ЗША ў Паўд. В'етнаме (1965—73) выклікала ўзмацненне антываен. руху, які ахапіў усе слаі насельніцтва. Пад ціскам мас урад Р. Ніксана [1969—74] вымушаны быў пачаць вывад войскаў з В'етнама, спыніць бамбардзіроўкі Паўн. В'етнама, адмовіцца ад прызыву ў армію. Але ЗША не спынілі ваен. дапамогі рэжыму Тхіеу, які ў 1975 быў скінуты нар. рэвалюцыяй.

ЗША. Прыём новых членаў у расісцкую арганізацыю Ку-клукс-клан.



ванняў ЗША на ўнутраную і знешнюю палітыку краіны. У жн. 1954 амер. канграс прыняў закон «Аб кантролі за камуніст. дзейнасцю», які па сутнасці паставіў КП ЗША па-за законам. Актывізавалася дзейнасць прафашысцкіх арг-цый («Таварыства Джона Берча», *Ку-клукс-клан*, Амерыканскі легіён і інш.). Знешнепалітычны курс быў накіраваны на рэмілітарызацыю і ўключэнне ФРГ у НАТО, на стварэнне новых агрэс. блокаў: *Арганізацыі дагавору Паўднёва-Усходняй Азіі* (СЕАТО), «Багдадскага пакта» (гл. *Арганізацыя Цэнтральнага дагавору*). ЗША выкарыстоўваюць узбр. сілы супраць нац.-вызв. руху народаў Блізкага і Сярэдняга Усходу (гл. *Эйзенхаўэра дактрына*). У чэрв. 1958 амер. войскі ажыццявілі інтэрвенцыю ў Ліван. Узмацнілася падрыўная дзейнасць ЗША супраць сацыяліст. краін.

Урады Дэмакр. партыі Дж. *Кенэдзі* [1961—63] і Л. Джонсана [1963—69] не здолелі вырашыць вострых сац. праблем, негрыцянскага пытання, спыніць рост злачыннасці, ліквідаваць беднасць. У знешняй палітыцы трымаліся агрэс. інтэрвенцыянісцкага курсу. ЗША ўдзельнічалі ў арганізацыі контррэвалюц. выступленняў супраць сацыяліст. Кубы (1961, 1962), у 1964 пачалі адкрытую агрэсію супраць В'етнама, у 1965 непасрэдныя ваенныя дзеянні супраць ДРВ, узброенае ўмяшанне ва ўнутр. справы Лаоса. У 1964—65 ажыццёўлены агрэс. акцыі ў Лац. Амерыцы (Панама, Дамініканская Рэспубліка) і ў Афрыцы (дапамога белым наймітам у Конга). Рэспубліканскі ўрад прэзідэнта Р. Ніксана [з 1969], як і папярэднія ўрады Дэмакр. партыі, пастаўлены перад сур'ёзнымі ўнутранымі і знешнепаліт. праблемамі. Краіна ўступіла ў палосу замаруджвання эканам. росту, якое на канец 60-х г. перарасло ў самы доўгі пасля скончэння 2-й сусв. вайны эканам. крызіс. На канец 70-х г. бяздзейнічала амаль чвэрць усіх вытв. магутнасцей. Небывалых памераў дасягнула інфляцыя.

Пахаванне лідэра негрыцянскага народа Амерыкі М. Л. Кінга.



У лют. 1971 налічвалася 5,5 млн. беспрацоўных, каля 40 млн. амерыканцаў жылі ў галечы. Нар. масы бяднеюць, прыбыткі манаполій павялічваюцца. За 1963—69 яны выраслі з 27 да 48,5 млрд. дол. Асн. іх крыніца — гонка



Сенатар Р. Кенэдзі ў першыя мінуты пасля раненняў.

ўзбраенняў. Ваенна-прамысл. комплекс займае ўсё больш дамінуючае становішча. Велізарныя памеры набыў мілітарызм (гл. ў раздзелах Гаспадарка, Узброеныя сілы). У краіне абвастраецца сац.-паліт. становішча. Нягледзячы на закон 1968, накіраваны супраць амерыканцаў, якія патрабуюць спыніць злачынную вайну ў В'етнаме, антываен. дэманстрацыі і мітынгі набываюць масавы характар. У 1969 у агульнанац. дні пратэсту супраць вайны ў В'етнаме ўдзельнічалі мільёны амерыканцаў, 24.4.1971 толькі ў Вашынгтоне і Сан-Францыска — больш за 700 тыс. чал. Антываен. выступленні зліваюцца з рухам за грамада. правы і свабоды, супраць расавай дыскрымінацыі, а таксама з шырокай стачачнай барацьбой рабочага класа супраць манаполій. У 1969—70 адбылося 11 200 забастовак, у якіх удзельнічала 5830 тыс. чалавек. Масавыя негрыцянскія хваляванні ў 1969 ахапілі 90 буйных гарадоў. Рэзка абвастрыліся праблемы моладзі. У лют. 1970 адбыўся ўстаноўчы сход маладзёжнай марксісцка-ленінскай арг-цыі ЗША «Саюза маладых рабочых за вызваленне». Кроўным жыццёвым інтарэсам амер. народа адпавядаюць заклікі КП ЗША. На яе XIX з'ездзе (1969) прынята новая праграма, якая вызначыла задачы амер. пралетарыяту ў барацьбе супраць манапаліст. капіталу.

На міжнар. арэне ЗША адыгрываюць ролю сусв. жандара, спараджаюць крызісныя сітуацыі ў розных раёнах зямнога шара. ЗША распырылі ваен. канфлікт ў Паўд.-Усх. Азіі. Амер. войскі ўварваліся ў Камбоджу (1970) і Лаос (1971), дзе заснавалі цяжкае паражэнне. Амер. ўрад падтрымлівае дамаганні ізраільскіх захопнікаў (гл. ў арт. *Ізраільская агрэсія*), імкнецца захаваць свой уплыў у Лац. Амерыцы, умацаваць НАТО, перашкодзіць стварэнню сістэмы агульнаеўрапейскай бяспекі. Агрэс. дзеянні амер. імперыялізму, антысав. правакацыі рэакц. колаў перашкаджаюць нармалізаваць адносіны паміж СССР і ЗША. З-за палітыкі амер. ўрада не атрымалі развіцця гандл., навукова-тэхн. і культ. сувязі паміж дзвюма краінамі.

Асноўныя палітычныя партыі і прафсаюзы. Рэспубліканская партыя (засн. ў 1854), Дэмакратычная партыя (засн. ў 1828) — асн. паліт. партыі амер. манапалістычнага буржуазіі. Пры поўным класавым адзінстве адрозніваюцца толькі тактыкай, прыёмамі і метадамі, якімі карыстаюцца іх лідэры ў штодзённай паліт. дзейнасці. Пастаянага членства не маюць, прыналежнасць да іх вызначаецца галасаваннем на выбарах. *Камуністычная партыя Злучаных Штатаў Амерыкі*. Засн. ў 1919. Каля 13 тыс. членаў. Нац. старшыня Г. Уінстан. Ген. сакратар Г. Хол. Амерыканская федэрацыя працы — Канграс вытворчых прафсаюзаў (АФП — КВП). Утворана ў 1955 у выніку аб'яднання АФП (засн. ў 1881) і КВП (засн. ў 1935). Аб'ядноўвае 128 прафсаюзаў, 13 млн. чал. Аб'яднанне прафсаюзных дзеячаў (АПД). Створана ў 1969. 4 млн. членаў.

Гаспадарка. ЗША — эканамічна самая развітая краіна капіталіст. свету. З канца 19 ст. займае першае месца па аб'ёме прамысл. і с.-г. вытворчасці. Хуткаму развіццю эканомікі садзейнічалі адсутнасць перажыткаў феадалізму ў вядучых эканам. раёнах краіны, вялікі прыток кваліфікаванай рабочай сілы і капіталаў з інш. краін, багатыя прыродныя рэсурсы, вялікія прыбыткі ад ваен. заказаў у гады 1-й сусв. вайны і тое, што пасля грамада. вайны 1861—65 на тэр. краіны не было войнаў. 2-я сусв. вайна аблегчыла выхад амер. эканомікі з эканам. крызісаў і дэпрэсій 30-х гадоў. У 2-ю сусв. вайну амер. капітал завалодаў вялікімі рынкамі прамысл. і с.-г. тавараў, узмацніўся *вываз капіталу* і ўплыў на краіны капіталіст. свету. Аднак доля ЗША ў сусв. эканоміцы паступова змяншаецца, а па тэмпах росту яны значна ўступаюць Японіі і большасці еўрап. краін. Доля ЗША ў прамысл. вытворчасці капіталіст. свету склала: 1938 — 36,6%; 1950 — 54,6; 1960 — 45,8; 1965 — 44,9; 1969 — 43,4; 1970 — 42,5%. На ЗША прыпадае каля $^1/_3$ прадуктаў с.-г. вытворчасці капіталіст. свету. ЗША займаюць 1-е месца па абароце знешняга гандлю (16% па аб'ёме экспарту ў 1969) і вывазе капіталу. Агульная сума прамых інвестыцый амер. карпарацый за мяжою ў 1969 складала больш за 75 млрд. дол.; каля 40% з іх прыпадала на Зах. Еўропу. Пранікненне манаполій ЗША ў эканоміку інш. краін з'яўляецца крыніцаю звышпрыбыткаў і сродкам закабалення і грабяжу многіх народаў. Эканоміка ЗША канцэнтруецца невялікай групай буйных манаполій. 18 фін.-манапал. груповак аб'ядноўваюць 750 найб. кампаній і банкаў, кантралююць каля 70% усіх актываў, 88% асн. фондаў прамысловасці. Капіталіст. вярхі прысвойваюць большую частку вынікаў працы амер. народа, асн. долю нац. даходу краіны. У 1967 на долю 20% багацейшых сем'яў прыпадала 41,2%, а на долю 5% самых багатых сем'яў — 14,3% даходу ўсіх сем'яў. Вылучаюцца фін. групы Морганаў і Рокфелераў, агульныя актывы банкаў і карпарацый якіх складаюць (1969) адпаведна 170 і 125 млрд. дол. Хутка растуць каліфарнійская і тэхаская групы, якія цесна звязаны з ваен. вытворчасцю. Паміж гэтымі групамі, а таксама ўнутры іх бесперапынна вядзецца жорсткая барацьба за большую долю ў прыбытках ад эксплуатацыі працоўных ЗША і інш. краін. Фін. капітал вызначае палітыку дзяржавы, шырока выкарыстоўвае дзярж. апарат для забеспячэння макс. прыбыткаў і ўмацавання ўлады манаполій (гл. *Дзяржаўна-манапалістычны капіталізм*). Мілітарызацыя эканомікі, росту якой спрыяе «халодная вайна» і эскалацыя ваен. дзеянняў у Індакітаі, садзейнічала ўтварэнню ваен.-прамысл. комплексу — рэакцыйнага саюзу федэральных ваен. улад і ваен.-прамысл. карпарацый. Ваен.-прамысл. комплекс уздзейнічае на ўсе бакі жыцця ЗША, з'яўляецца састаўной часткаю эканам. структуры капіталізму. Ваенны бюджэт на 1971 складае 78,7 млрд. дол. (без расходаў Пентагона, ЦРУ і Камісіі па атамнай энергіі) — 34% усяго бюджэту краіны. 7,6 млрд. дол. (1971) прызначаецца на развіццё ракетна-ядзернага ўзбраення. *Агульны крызіс капіталізму* з усёй паўнатой выявіўся ў эканоміцы, грамадскім і паліт. жыцці ЗША. Паміж 1-й і 2-й сусв. войнамі эканоміку ЗША тройчы (у 1920—21, 1929—33 і 1937—38), а пасля 2-й сусв. вайны чатыры разы (1948—49, 1953—54, 1957—58, 1960—61) ахоплівалі эканамічныя крызісы. Мілітарызацыя эканомікі не здолела папярэдзіць новы крызіс, які пачаўся ў 1970 (спад тэмпаў вытворчасці і рост беспрацоўя).

Прамысловасць дае 25% нац. даходу, занятых у ёй у 6 разоў больш, чым у с. гасп. Характэрна высокая канцэнтрацыя вытвор-

Штат Агайо. Горад Уіртан. Сталеплавільны завод ноччу.



часці, цэнтралізацыя і манапалізацыя капіталу. Індэкс аб'ёму прамысл. вытворчасці (за 100 прыняты сярэдні ўзровень 1957—59) склаў: 109 у 1960; 143 у 1965; 166 у 1968; 172 у 1969 і 163 у 1970. Развіццё прамысловасці ЗША характарызуецца рэзкай нераўнамернасцю, намеры прамысл. вытворчасці — вялікімі ваганнямі. Хутка развіваюцца толькі галіны прамысловасці, звязаныя з ваен. вытворчасцю,— ракетна-касмічная, радыёэлектронная, атамная, нафтахімічная. (Вытворчасць асноўных прамысловых тавараў у ЗША гл. ў табл. 2.)

Табліца 2

Вытворчасць асноўных прамысловых тавараў у ЗША

	Адзінкі вымярэння	1937	1958	1967	1969
Вугаль	млн. *т*	451	372	508	494
Нафта	»	173	331	435	455
Прыродны газ	млрд. м³	70	312	511	579
Жалезная руда*	млн. *т*	37	37	47	50
Электраэнергія	млрд. *кет·гадз*	147	725	1317	1552
Чыгун	млн. *т*	38	53	80	86
Сталь	»	51	77	115	128
Цэмент	»	20	55	65	65
Аўтамабілі	млн. шт.	2,5	5,1	9,0	10,1
Трактары, без садова-агародных	тыс. шт.	272	266	262	210
Гандлёвыя судны, спушчаныя на ваду	тыс. бр. рэг. *т*	160	732	242	400
Сінтэтычны каўчук	тыс. *т*	0,5	1072	1942	2280
Пластмасы	»	70	2112	5736	7740
Серная кіслата	млн. *т*	4,5	14	26	26
Баваўняныя тканіны	млрд. м	7,9	8,2	7,6	6,5
Шарсцяныя тканіны	млн. м	500	248	218	251
Абутак	млн. пар	412	587	600	587


* Па ўтрыманні металу.

Даволі хутка расце вытворчасць электраэнергіі. Гал. роля ў энергабалансе належыць нафце і газу. Манаполіі ЗША кантралююць ²/₃ здабычы нафты ў капіталіст. свеце. Доля асн. крыніц энергіі ў спажыванні ЗША (у %): нафты 44 у 1968 і 13,4 у 1920; прыроднага газу адпаведна 30 і 4,3; кам. вугалю 22 і 78,4; гідраэнергіі і атамнай энергіі 4 і 3,9. Устаноўленая магутнасць эл. станцый 350 млн. *кет* (1970, у т. л. дзейных АЭС — 4 млн. *кет*). ⁴/₅ электраэнергіі даюць ЦЭС, найб. з іх на Пн краіны. Пабудаваны шэраг АЭС у прамысл. р-нах Пн і З. Вялікія запасы рудаў і энергарэсурсаў спрыялі развіццю чорнай і каляровай металургіі. Магутнасць сталеліцейных агрэгатаў у 1970 склала каля 180 млн. *т*. Выплаўлена (1969) 3441 тыс. *т* алюмінію (1-е месца ў свеце). Па выплаўцы медзі, свінцу і цынку (з імпартнай руды і канцэнтратаў) ЗША належыць 1-е месца ў свеце. Развіта аўтамаб., авіяц., эл.-тэхн., станкабуд. прамысловасць, вытворчасць абсталявання для прамысл., буд-ва і с. гасп. Тры найб. кампаніі ЗША («Джэнерал моторз», «Форд мотар» і «Крайслер») даюць каля 85% аўтамабіляў; палову с.-г. машын выпускае кампанія «Інтэрнэйшнл харвэстэр». Авіяц. і ракетна-касм. прамысловасць выконвае пераважна ваен. заказы. (Размяшчэнне найбольш важных радовішчаў карысных выкапняў, цэнтраў апрацоўчай прамысловасці, раёнаў спецыялізацыі сельскай гасп. гл. на каляровай карце-ўклейцы.) У хім. прамысловасці побач з вытворчасцю мінер. кіслот, шчолачаў, угнаенняў і інш. усё большае значэнне набывае нафтахімія (вытворчасць пластмас і арган. смолаў, сінт. каўчуку, штучных і сінт. валокнаў). Атамная прамысловасць поўнасцю пастаўлена на службу ваен. мэтам. Найб. прадпрыемствы па вытворчасці ядз. гаручага: з-ды па атрыманні урану-235 у Ок-Рыджы (штат Тэнесі), Падзьюцы (штат Кентукі) і Портсмуце (штат Агайо); плутоніевы з-д у Ханфардзе і з-д плутонію, дэйтэрыю і трытыю (кампаненты вадароднай бомбы) у Савана-Рыверы (штат Паўд. Караліна). Сярод галін лёгкай прамысловасці найб. развіты тэкст., швейная, палігр. і гарбарна-абуткавая. Развіта мясная, малочная і мукамольная прамысловасць. Вытворчасць розных кансерваў.

Сельская гаспадарка характарызуецца рэзка выражанай спецыялізацыяй і канцэнтрацыяй вытворчасці. Пераважаюць фермы з таварнай прадукцыяй ад 10 тыс. дол. і вышэй кожная, якія даюць каля 85% таварнай прадукцыі. 4,6% найб. фермаў валодаюць 52,6% с.-г. зямель і 24,3% пасяўных плошчаў. Дробныя і сярэднія фермеры ва ўмовах канкурэнцыі і абмежаванасці рынку збыту разараюцца і папаўняюць армію наёмных с.-г. рабочых і беспрацоўных. Колькасць фермаў скарацілася з 6,8 млн. ў 1935 да 3 млн. у 1969. Вытв. адносіны, якія пануюць у краіне, не даюць магчымасці спажываць вырабленую с.-г. прадукцыю пры існуючых цэнах. Скарачаюцца с.-г. плошчы, асігноўваюцца вял. сродкі на зберажэнне запасаў с.-г. прадукцыі. У той жа час 40 млн. амерыканцаў галадаюць і недаядаюць. У с. гасп. занята 4,3 млн. чал., у т. л. 1 млн. наёмных работных. С. гасп. дае 2,8% (1968) нац. даходу. Пад ворывам — 18,8% тэр. краіны і 27,7% пад лугамі і пашаю. Гал. кармавая культура — кукуруза (¹/₂ збору капіталіст. краін). Важнае месца займаюць кармавыя травы і сорга. Гал. харч. культура — пшаніца. З тэхн. культур пашыраны бавоўнік, соя, тытунь, па зборы іх ЗША займаюць 1-е месца ў капіталіст. свеце. Садоўніцтва і агародніцтва. Вырошчваюць таксама бульбу, жыта, авёс, ячмень і інш. (плошчы і збор асноўных с.-г. культур гл. ў табл. 3). Жывёлагадоўля мясная і малочная кірунку. У 1969 было (млн. галоў): буйн. раг. жывёлы 109,7 (у т. л. дойных ка-



1


2


3

Злучаныя Штаты Амерыкі I.


1. Ландшафт Новай Англіі. Штат Вермонт.
2. Іасеміцкі вадаспад на р. Мерсед у гарах Сьера-Невада. Штат Каліфорнія.
3. Буйная рагатая жывёла на пашы. Штат Арызона.
4. Сталеліцейны завод у Пітсбурзе. Штат Пенсільванія.
5. Нафтавы промысел. Штат Каліфорнія.
6. Кліўленд — буйны прамысловы цэнтр Цэнтральных штатаў ПнУ ЗША.
7. Горад Нью-Йорк.


4


5


6


7



1



2



3




4


5

Злучаныя Штаты Амерыкі II.


1. Дэманстрацыя пратэсту супраць вайны ў В'етнаме.
2. Горад Хартфард. Вуліца пасля сутычкі паліцыі з дэманстрантамі-неграмі.
3. Жыллё індзейскай сям'і.
4. Расправа са студэнтамі-забастоўшчыкамі Гарвардскага універсітэта.
5. Беспрацоўныя каля біржы працы ў мястэчку Канаган.




1



2



3




4


Злучаныя Штаты Амерыкі III.

1. Від на Нью-Йорк з боку порта на р. Гудзон.
2. Р. Б. Фулер. Батанічны сад у Сент-Луісе. 1960.
3. Шматкватэрныя вежы ў Марына-Сіці. Чыкага. 1964.
4. М. Ямасакі і інш. Будынак кампаніі «Рэйналдс металз». Мічыган. 1959.
5. Ф. Л. Райт. Дом Каўфмана («Над вадаспадам») у Бер Ране. 1936.
6. Эра Саарынен і інш. Тэхнічны цэнтр кампаніі «Джэнерал мотарз» каля Дэтройта. 1953—55.






5



6







Злучаныя Штаты Амерыкі IV.

1. Дж. Уістлер. Партрэт міс Сайслі Александэр. Гармонія шэрага з зялёным. 1872—74. Нац. галерэя. Лондан.
2. У. Хомер. Гальфстрым. 1899. Метраполітэн-музей. Нью-Йорк.
3. Э. Уаес. Сын Альберта. 1959. Нац. галерэя. Осла.
4. Г. Вуд. Амерыканская готыка. 1930. Інстытут мастацтваў. Чыкага.
5. Р. Соер. Дзеці горада. Зборы мастака.
6. Дж. Белаўз. «Стаўце ў Шаркіі». 1909. Маст. музей. Кліўленд.
7. Р. Кент. Сабакі ў фіёрдзе Кангердлуарсук. 1932—33. Музей выяўл. мастацтваў імя Пушкіна. Масква.









Клеймаванне цялят на ранча (штат Вашынгтон).

роў 14,1), свіней 57,2, авечак 21,1. Развіта птушкагадоўля (куры, індыкі).

Табліца 3

Плошча і збор асноўных сельскагаспадарчых культур у ЗША

Культуры	Плошча, млн. га				Збор, млн. т			
	у сярэднім за		1968	1969	у сярэднім за		1968	1969
	1934—1938	1950—1959			1934—1938	1950—1959		
Пшаніца	22,4	22,7	22,4	19,2	19,5	29,8	42,7	39,6
Ячмень	3,9	5,0	3,9	3,8	5,5	7,7	9,1	9,1
Авёс	14,1	14,3	7,2	7,3	14,0	18,6	13,5	13,6
Жыта	1,3	0,7	0,4	0,6	1,0	0,6	0,6	0,8
Кукуруза	37,3	27,7	22,5	22,5	53,1	76,6	111,1	112,8
Соя (боб)	1,0	7,3	15,0	16,5	1,2	10,6	28,9	30,4
Бульба	1,3	0,6	0,6	0,6	2,8	2,9	14,1	13,9
Цукровыя буракі	0,3	0,3	0,5	0,6	8,1	12,1	22,4	25,9
Бавоўнік (валакно)	11,5	7,6	3,7	3,8	10,0	10,6	2,4	2,3

Транспарт і гандаль. Даўж. чыгунак 337 тыс. *км*, 85% аднакалейныя, 3,3 тыс. *км* электрыфікаваны. Расце ўдзельная вага аўтатранспарту і авіяцыі. Аўтамаб. дарог 5961 тыс. *км*, у т. л. з цвёрдым пакрыццём 4597 тыс. *км*. Аўтапарк (млн. адзінак, 1968) — 101,1, у т. л. легкавыя 83,3, грузавыя і аўтобусы 16,3. Вял. значэнне мае марскі, рачны і трубаправодны транспарт. Гал. порты: Нью-Порк, Філадэльфія, Сан-Францыска, Лос-Анджэлес, Новы Арлеан, Чыкага і інш. Танаж гандл. флоту — 19 550 тыс. бр. рэг. *т* (1969). Экспарт (1969) 37,5 млрд. дол., імпарт 35,9 млрд. ЗША вывозяць машыны (аўтамабілі, самалёты) і трансп. абсталяванне, хімікаліі, кам. вугаль, чорныя і каляровыя металы, бавоўну і тэкст. вырабы, харч. тавары, тытунь; прывозяць прамысл. сыравіну, гатовыя вырабы, сталь, медзь, алюміній, волава, нафту і нафтапрадукты. Асн. партнёры ў гандлі: Канада, краіны Лац. Амерыкі, Японія, ФРГ, Вялікабрытанія, Італія, Аўстралія, Індыя, ПАР, Філіпіны. Грашовая адзінка — долар.

Узброеныя сілы ЗША складаюцца з рэгулярных войск і рэзерваў. У складзе рэгулярных войск сухапутныя войскі, ВПС і ВМС. Вярх. галоўнакамандуючы — прэзідэнт. Міністр абароны назначаецца прэзідэнтам з цывільных асоб на 4 гады. Узбр. сілы камплектуюцца на аснове закону аб усеагульнай вайсковай павіннасці, аднак асн. спосабам камплектавання з'яўляецца вярбоўка добраахвотнікаў. Агульная колькасць узброеных сіл 3,5 млн. чал. (1970), значная іх частка за межамі ЗША: у Еўропе, у Паўд. В'етнаме, Паўд. Карэі, на в-ве Акінава, у зоне Панамскага канала і інш. Узброеныя сілы ЗША зведзены ў камандаванні (падпарадкоўваюцца міністру абароны) — стратэгічных ВПС, узброеных сіл у зонах Ціхага і Атлантычнага акіянаў, Еўропы, Аляскі, Цэнтр. і Паўд. Амерыкі, а таксама ўдарнае камандаванне і камандаванне ППА на кантыненце ЗША. Сухапутныя войскі (каля 1 млн. 500 тыс.) налічваюць 18 дывізій (4 бранятанкавыя, 4 механізаваныя, 7 пяхотных, 1 паветрадэсантная, 2 аэрамабільныя) і 10 асобных брыгад. Уваходзяць таксама часці армейскай авіяцыі (11 тыс. самалётаў і верталётаў). Каля 200 тыс. чал. сухапутных войск перададзена ў склад аб'яднаных узброеных сіл НАТО (знаходзяцца ў ФРГ). ВПС (869 тыс. чал., каля 15 тыс. самалётаў і 1054 міжкантынентальныя балістычныя ракеты «Мінітмен» і «Тытан») падзяляюцца на камандаванні: стратэгічнае, тактычнае, камандаванне ППА і інш. На ўзбраенні самалёты розпага прызначэння: стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі (посьбіты ядз. зброі), тактычныя знішчальнікі (частка іх можа несці ядз. зброю), разведвальныя і інш. Большасць самалётаў звышгукавой скорасці. ВМС (каля 1 млн. 63 тыс. чал. разам з марской пяхотай) маюць 2 формы арг-цыі: адміністрацыйную і аператыўную. У адпаведнасці з адміністрацыйнай арг-цыяй ВПС зведзены ў 2 флоты — Атлантычны і Ціхаакіянскі. У рэгулярных ВМС больш за 800 баявых караблёў, у т. л. 16 ударных авіяносцаў (на борце кожнага можа быць па 80 самалётаў), 41 атамная ракетная падводная лодка, 46 атамных і 69 звычайных падводных лодак, каля 300 надводных баявых, 120 дэсантных караблёў і больш як 200 дапаможных суднаў. Авіяцыя ВМС налічвае каля 8500 самалётаў і верталётаў. Асн. рэзервы — нац. гвардыя арміі і ВПС, рэзервы арміі, ВПС і ВМС. У складзе рэзерваў каля 2 млн. 500 тыс. чал., у т. л. ў рэзерве 1-й чаргі 1 млн. 700 тыс. Найб. боегатоўная частка рэзерваў — нац. гвардыя. Яна размяшчаецца ва ўсіх штатах краіны і выкарыстоўваецца для задушэння барацьбы працоўных і выступленняў неграў за свае правы. На міжнар. арэне ўзбр. сілы ЗША выконваюць ролю сусв. жандара. У інтарэсах манаполій служаць для задушэння нац.-вызв. руху, ажыццяўлення палітыкі «з пазіцыі сілы», для падтрымкі рэакц. рэжымаў, у т. л. шляхам адкрытай агрэсіі, з'яўляюцца ўдарнай сілай імперыялістаў. дзяржаў, накіраванай супраць сусв. сацыялістаў. сістэмы. Для гэтага ЗША ствараюць агрэс. ваенныя блокі, шматлікія ваен. базы на тэрыторыі іншых краін.


Ахова здароўя прыватнакапіталістычная, заснаваная на куплі і продажы мед. дапамогі. Даярж. сац. страхавання па хваробах няма. У 1968 было больш за 2163 тыс. бальнічных ложкаў (11,5 на 1 тыс. ж.), 305 тыс. урачоў (1 на 650 ж.), 98 тыс. стаматолагаў, 122 тыс. фармацэўтаў. 26% урачоў — імігранты. Імігрыруючы урачоў ЗША эканомяць сродкі на іх падрыхтоўку. Каб замяніць замежных спецыялістаў, патрэбна не менш як 12 новых мед. ін-таў. У ЗША 20% бальніц не маюць добрых памяшканняў і абсталявання, 50% ложкаў заняты хворымі на псіхічныя парушэнні. Не хапае мед. кадраў, асабліва мед. сёстраў. Атрымаць мед. адукацыю большасці маладых людзей немагчыма з-за празмерна вялікага кошту навучання. Плата за мед. і медыкаментозную дапамогу вельмі высокая.

Выдаткі амерыканцаў на лячэнне і медыкаментознае абслугоўванне ў 1969 склалі 50 млрд. дол. (у 1953 — 17 млрд.), у 1975 мяркуецца каля 100 млрд. Кожны член амерыканскай сям'і траціць за год 250 дол. на лячэнне і медыкаменты. Кошт мед. абслугоўвання ў 1970 у параўнанні з 1960 павялічыўся на 150%, плата за дзень бальнічнага лячэння — на 155, плата прыватнаму ўрачу — на 57,5%. Выдаленне апендыкса каштуе 100—150 дол., нараджэнне дзіцяці ў бальніцы — 500—600 дол. і больш. Асн. лекарствы — патэнтаваныя сродкі — прадаюць у 20—50 разоў вышэй за выдаткі на іх вытворчасці. Фармацэўтычныя фірмы выпускаюць бесрэцэптныя, надзвычай і нават шкодныя лекавыя сродкі. Невырашальнымі праблемамі астаюцца нервова-псіхічныя, венерычныя, сардэчна-сасудзістыя хваробы, рост колькасці разумова адсталых дарослых і дзяцей, наркаманія і алкагалізм. На псіхічныя і неўралагічныя парушэнні хварэе каля 10 млн. чал., штогод рэгіструецца да 150 тыс. новых выпадкаў гэтых хвароб. Сярод насельніцтва ва ўзросце больш як 20 гадоў 5 чал. з 100 хварэюць на алкагалізм (10 млн. хранічных алкаголікаў). На ножнага чалавека ў ЗША спажываецца штогод 4,5 л абс. алкаголю. Разумова адсталых дарослых і дзяцей складаюць каля 5—6 млн.,— 3% усяго насельніцтва (3 тыс. на кожныя 100 тыс. ж.). Штогод нараджаецца больш за 125 тыс. алігафрэнаў. У 1969 было каля 500 тыс. (245,9 на 100 тыс. ж.) захворванняў на ганарэю і 102 581 (51,4 на 100 тыс. ж.) — на сіфіліс (1967). Каля 200 тыс. наркаманаў (1 на 1 тыс. ж.), 90% з іх да 40 гадоў, 91% наркаманаў ужываюць гераін (1967). Нараджальнасць (1967—68) 17,9 (23,3 у 1961), агульная смяротнасць 9,4, натуральны прырост 8,5 на 1 тыс. ж.; дзіцячая смяротнасць 22,1 на 1 тыс. жыванароджаных.

Асвета, навуковыя ўстановы. Сістэма адукацыі ЗША фактычна мае на мэце даць паўнацэнную адукацыю прадстаўнікам пануючага класа. У гарадах, асабліва ў раёнах негр. гета, не хапае школ. Асн. праблема — недахоп кваліфікаваных пед. кадраў, нізкая аплата працы настаўнікаў. Каля 8 млн. насельніцтва ЗША астаецца непісьменным (1969). Сістэма нар. асветы кіруецца антыдэманр. буржуазны адбору «таленавітых» навучэнцаў. Адзіных і абавязковых праграм няма. Найб. пашыраная структура агульнаадук. школы мае тры ступені: элементарная (6 гадоў), малодшая сярэдняя і старшая сярэдняя школы (па 3 гады). Кожная ступень — самастойная навуч. установа. У элементарную школу прымаюцца дзеці з 6 гадоў. Ва ўсіх школах вучні падзяляюцца на 3 катэгорыі: «моцных», «сярэдніх», «слабых». Ды пераходзе ў малодшую сярэднюю школу (7—9 кл.) кожная з гэтых катэгорый утварае асобную паралель. Старшая школа (10—12 кл.) падзяляецца на мноства профіляў: анадэмічны, агульны, камерцыйны і інш. Кожны профіль мае наўны набор абавязковых і факультатыўных прадметаў. Звычайна толькі акад. профіль дае магчымасць паступіць у ВНУ (каля 25% навучэнцаў), астатнія профілі рыхтуюць моладзь да прам. дзейнасці. Значная колькасць дзяцей (амаль 40%) в-за матэрыяльных цяжкасцей не



Дэманстрацыя студэнтаў у Мадысане супраць расізму і дыскрымінацыі каляровага насельніцтва.



Музей амерыканскага мастацтва імя Уітні у Нью-Ёрку.

ваканчвае школы. Для дзяцей заможных слаёў насельніцтва існуюць прывілеяваныя прыватныя школы з пансіянатамі. У ВНУ навучанне платнае, даступнае толькі моладзі маёмных класаў. Вышэйшая адукацыя для негрыцянскай моладзі амаль не даступная. Паводле афіц. звестак (1966) у ЗША в «нізшэйшай» сацыяльнай групы было толькі 3% студэнтаў ВНУ (да 1970 становішча амаль не змянілася). Тэрмін навучання 4—5 гадоў. ВНУ: *Гарвардскі універсітэт*, Іельскі, Пенсільванскі, Прынстанскі, Калумбійскі, Дж. Хопкінса ун-ты і інш. Найбольш вядомыя б-кі Кангрэсу ў Вашынгтоне, публічныя б-кі ў Нью-Ёрку, Чыкага, Бостане, Лос-Анджалесе, Кліўлендзе, б-кі ун-таў. Музеі: Нац. музей ЗША ў Вашынгтоне, Метрапалітэн-музей, амер. мастацтва, побыту амер. індзейцаў (усе ў Нью-Ёрку), Чыкагскі прыродазнаўча-гістар. музей і інш.

У 1966 налічвалася больш за 2300 ун-таў і каледжаў усіх тыпаў, у 1184 з іх рыхтаваліся навук. работнікі і інжынеры. Больш чым у 600 вялася н.-д. работа. У 1965 прыватныя фірмы аміщчаўлялі 67% усіх н.-д. работ, 15% — урадавыя ўстановы і 9% — ун-ты і каледжы. Даследчыя работы ў прыватных фірмах вельмі канцэнтраваны: амаль 90% іх ажыццяўляюць прыкладна 400 кампаній, у кожнай з якіх працуе больш за 5 тыс. чал. Найб. высокі ўзровень даследаванняў у авіяц., аўтамаб., радыёэлектроннай, электратэхн., хім, прамысловасці, ракетабудаванні. Значная частка даследаванняў мае ваен. характар. Да 2-й сусв. вайны агульныя выдаткі на н.-д. работы складалі менш як 1 млрд. дол. за год, у 1953 — 5,6 млрд., у 1956 — 23 млрд., у 1970 — 26 млрд. дол. Паводле ацэнак дэпр. асігнаванні ў 1970 прыкладна 100 млн. дол., у 1966 амаль 16 млрд. дол.— в іх 85% на ваен. мэты. На 1971/72 фін. год толькі Мін-ву абароны ЗША выдадзена 7,5 млрд. дол. на н.-д. работу. Вялікія сумы асігнаваны нац. управленню па аэранаўтыцы і даследаванні касм. прасторы, а таксама камісіі па атамнай энергіі. У 1966 Масачусецкі тэхнал. ін-т выканаў заказы Пентагона на 119 млн. дол., Дж. Хопкінса — на 57 млн., Каліфарнійскі ун-т — на 17 млн., Калумбійскі — на 9 млн. і інш. За 1951—70 выдаткі Пентагона на ваен. н.-д. і доследна-канструктарскія работы склалі 95 млрд. дол. Створаны даследчыя цэнтры (пераважна ваен. характару), якія фінансуюцца ўрадам: лабараторыя ў Оак-Рыджы, лабараторыя па атамнай энергіі ў Бетсі, на радыяцыі ў Лос-Аламасе і інш. Павялічылася сетка дзярж. устаноў, што займаюцца пытаннямі навукі і тэхналогіі. У сенаце створана 13 камітэтаў па гэтых пытаннях, у палаце прадстаўнікоў — 14. Пры прэзідэнце ЗША есць спец. намочнік па навуцы і тэхналогіі, а таксама ўпраўленне па навуцы і тэхналогіі, кансультатыўны н-т па навуцы, федэральны савет па навуцы і тэхналогіі. У 1968 у 22 штатах і 5 вял. гарадах створаны ўпраўленні, якія займаюцца пытаннямі навукі і тэхнікі. Есць Нац. акадэмія навук, Нац. даследчы цэнтр, які распрацоўвае палітыку ў навуцы, даюць рэкамендацыі ўрадавым і прыватным арг-цыям. Н.-д. работу вядуць усе мін-ны і інш. ўрадавыя ўстановы. Напярэдадні 2-й сусв. вайны было 92 тыс. навук. работнікаў, у т. л. на ўн-тах і каледжах 40 тыс., у прыватных фірмах — 35 тыс., на ўрадавых органах — 17 тыс. Студзень д-ра н. мелі 17,3 тыс. чал. У 1965 працавала 500 тыс. навук. работнікаў, больш за 150 тыс. мелі ступень д-ра н. На ун-тах і каледжах было 168 тыс. навук. супрацоўнікаў (1965). Сярод іх 94 тыс. д-роў н. (д-р н. ЗША адпавядае канд. навук СССР). У 1970 даследаваннямі было занята не менш як 2 млн. чал. Значная частка амер. вучоных і спецыялістаў — грамадзянне інш. краін, якія пераязджаюць у ЗША. Толькі за 1962—66 у ЗША з іншых краін эмігравала каля 60 тыс. высокакваліфікаваных спецыялістаў. Служба навук.-тэхн. інфармацыі ўключае Нац. даведачна-навук. цэнтр пры бібліятэцы Кангрэсу, службу навук. інфармацыі і камітэт па навук.-тэхнічнай інфармацыі.

Друк, радыё, тэлебачанне. Прэса, радыё, тэлебачанне — фармацыя шырока вынарыстоўваюцца пануючымі коламі ЗША для ідэалагічнай апрацоўкі мас, з'яўляюцца адным з гал. сродкаў антыдэманр. імперыял. прапаганды. Выданне буйнейшых газет і часопісаў манапалізавала невял. колькасць выдавецкіх канцэрнаў, газетных трастаў, інфармац. агенцтваў, прэс-сіндыкатаў і т. ін. Непасрэдных органаў друку, ім належаць даходы, дэпартамент. Самымі наклёмкімі тыражамі выходзяць газеты: «The New York Times» (Нью-Ёркскі час»), «The Washington Post» («Вашынгтонская пошта»), «New York Daily News» («Нью-Ёркскія штодзённыя навіны»), «Chicago Tribune» («Чыкагская трыбуна»), «Washington Daily News» («Вашынгтонскія штодзённыя навіны»), часопісы: «United States News and World Report» («Навіны Злучаных Штатаў і свет. агляд»), «Time» («Час»), «Newsweek» («Навіны тыдня»), «Life» («Жыццё»), «Look» («Погляд»), «Fortune» («Лёс»). Пануючыя колы ЗША усялякі перашкаджаюць выданню незалежных ад капіталу і бурж. крыніц інфармацыі прагрэс. газет і часопісаў, шырока інфармацыі прагрэс. друку выдаецца на рускай, украінскай, армянскай, літоўскай, польскай і інш. мовах. Кампартыя ЗША выдае штодзённую газету «Daily World» («Штодзённы свет») і часопіс «Political Affairs» («Пытанні палітыкі»). У ЗША працуюць 400 амерыканскіх радыё- і каля тысячы тэлевізійных станцый, якія цэнтралізуюцца манапаліст. аб'яднаннямі. Найбуйнейшыя радыёвешчальныя кампаніі: American Broadcasting Company (Эм-Бі-Сі), Columbia Broadcasting System (Сі-Бі-Эс), National Broadcasting Company (Эн-Бі-Сі) і на службе ЦРУ адзін з цэнтраў хлуслівай інфармацыі радыёстанцыя «*Свабодная Еўропа*». Інфармацыю распаўсюджваюць агенцтвы: Associated Press (АР, гл. *Асашыэйтэд прэс*) — аб'ядноўвае 7 тысяч выдаўцоў амер. газет; United Press International (ЮПІ), кантралюецца прыватным капіталам; ЮСІА — урадавае арг-цыя, цэнтр фальшывай прапаганды за мяжой (гл. *Інфармацыйнае агенцтва ЗША*). Мае 315 аддзяленняў больш як у 100 краінах свету. Ёй належыць радыёстанцыя «*Голас Амерыкі*», якая, як і многія іншыя, вядзе прапаганду супраць сацыялізму, краін.

Літаратура. Першыя літ. творы пазнаёліся ў пач. 17 ст. (апісанні калан. побыту і рэлігійна-пуританскай л-ры). Пазней узнікла дэмакр. аналітычна багатая л-ры (Р. Уільямс, Т. Гукер, Т. Мортан). У 18 ст. развіваецца л-ра Асветніцтва, якая дасягнула росквіту ў эпоху вайны за нац. незалежнасць 1775—83 (Б. Франклін, Т. Пейн, Т. Джэферсан). З таго часу пачалося фарміраванне нац. л-ры ЗША. Вытокі амер. пазаў ў творчасці Ф. Фрэно, у якой побач з класіцызмам адчуваліся парасткі рамантызму. Стваральнікам перадрамантычнага рамана быў Ч. Браўн. У пач. 19 ст. выступілі пісьменнікі-рамантыкі У. Ірвінг, У. К. Брайант, Дж. Ф. Кунер; у іх творах паэтызацыя прыроды спалучаецца з непрымірымым бурж. цывілізацыі. Рамантыкі распрацавалі трагічны лёс індзейцаў Амерыкі, сцвярджалі чалавечую годнасць сумленных і простых працаўнікоў. Раманы Кунера, пазнія Г. У. Лангфела цесна звязаны з амер. фальклорам. Найб. значны прадстаўнік паэт. прозы У. Ірвінг, які ў амер. рамантызме Ф. А. По ў апавяданнях і вершах стварыў гратэскавыя парэлы на ўсё страшнае і антычалавечнае ў бурж. свеце. Залежнасць ад традыцый еўрап. л-ры наступо-

ва саступае месца нац. тэмам, падтрыманым у 40-я г. 19 ст. літ. групай «Маладая Амерыка». Росквіт рамант. л-ры у 1-й пал. 50-х г. называюць «амер. Адраджэннем» (творы Н. Хотарна, Р. У. Эмерсана, Г. Тора, Г. Мелвіла). Група пісьменнікаў, філосафаў і публіцыстаў, т. зв. трансцэндэнталістаў (Эмерсан, Тора, М. Фулер і інш.) в рамант. пазіцый крытыкавала канфлікты. «праграсе». Тора выступіў на абарону правоў амер. неграў. У сярэдзіне 19 ст. пашырэцца л-ра абаліцыянізму, руху за адмену рабства ў ЗША; найб. відомы твор абаліцыяністаў — раман Г. *Бічэр-Стоў* «Хаціна дзядзькі Тома» (1852), у якім рэалістычна адлюстраваны жахі рабаўладальніцтва. Пад уплывам грамадз. вайны 1861—65 узмацніласа развіццё рэалізму у амер. л-ры, якое пачалося у 40-я г. Пазаіі У. *Уітмена* — пераход ад рамантызму да рэалізму, адзначана глыбокім дэмакратызмам і пазатарствам верша. Рэаліст, характар мела дэмакр. творчасць Ф. Б. *Гарта*. Раманы І. Джэймса раскрывалі псіхал. напружанасць метад прагрэс. л-ры ЗША у канцы 19 ст.— крытычны рэалізм, станаўленне якога звязана у першую чаргу з творчасцю гумарыста і сатырыка М. *Твэна*, які у раманах, апавяданнях і сатыр. памфлетах рэзка выкрываў сац. ваганы. Сярод рэалістаў канца 19 ст.— У. Д. Хоўэлс, Дж. дэ Форэст, Х. Гарленд, С. Крэйн, Р. Хэрык, Х. Фрадэрык. Сац. рэаліст, раман развівалі Ф. Норыс, Дж. *Лондан*, Т. *Драйзер*. На пач. 20 ст. пазнілся літ. рух «разграбальнікаў гразі» на чале з Л. Стэфенсам. Прадстаўнік гатага кірунку Д. Сінклер у рамане «Джунглі» востра крытыкаваў уладу манапалій. У найлепшых пазелах О. *Генры* з глыбокім сачуваннем адлюстравана жыццё «маленькага чалавека» на ўмовах бурж. грамадства. У 10—20-я г. стварылася раманск. л-ра (А. Р. Уільямс, М. Голд і інш.); самы выдатны прадстаўнік яе, пачынальнік сацыяліст. рэалізму у амер. л-ры Дж. *Рыд* у кн. «Дзесяць дзён, якія ўзварухнулі свет» адзін з першых прыкладаў і праўдзівага апісаў Кастр. рэв. у Расіі. У 20—30-я г. побач з Драйзерам працавала плеяда новых пісьменнікаў (Ш. *Андэрсан*, С. Льюіс, Ф. С. Фіцджэральд, Э. *Хемінгуэй*, У. Фолкнер, Т. Вулф, Дж. Стэйнбек), якія ў напружанай барацьбе з мадэрніямам і фармалізмам (творчасць Г. Стэйн, Т. С. Эліята, Э. Паунда) адстойвалі і узбагачалі традыцыі крытычнага рэалізму. Дэмакр. рух 30-х г. у ЗША, поспехі будаўніцтва сацыялізма у СССР спрыялі росквіту прагрэс. л-ры (А. Мальц, Л. Х'юз, Голд), узмацненню масавых прагрэс. літ. арганізацый (клубы Дж. Рыда), развіццю прагрэс. журналістыкі. Папярэдніі 2-й сусв. вайны узмацніліся антыфаш. перакананні Льюіса, Хемінгуэя і Драйзера, які ў канцы жыцця прыйшоў да камуністыч. светапогляду. У перыяд мабілізацыі да барацьбы з фашызмам і вайной прагрэс. пісьменнікі жорстка праследаваліся, крытыка-рэаліст. л-ра была ў вайнадае. У 50—60-я г. у процілегласць л-ры імперыял. рэакцыі з яе прапагандай мілітарызму, гвалту, парнаграфіі і канфармісцкай л-ры з яе ўслаўленнем «амер. ладу жыцця» стваралася л-ра, якая прадаўжала рэаліст. і гуманіст. традыцыі, з крытычных пазіцый адлюстроўвала амер. рэчаіснасць (Дж. Д. Салінджэр, Дж. Апдайк, Т. Капатэ, С. Белоў, К. Мак-Калерс, У. Стайран, Б. Маламуд, Дж. Чывер); узнікла л-ра «бітнікаў» (Дж. Керуак і інш.), накіраваная супраць афіц. ідэалогіі і маралі амер. абывацеля. Анарх. дробнабурж. бунт «бітнікаў» не меў арганізаванага палітычнага характару, што абмежавала іх выступленне. З грандыёзным размахам барацьбы неграў за рэалізацыю звязаны ўздым негрыцянскай л-ры, прасякнутай пратэстам супраць расавай дыскрымінацыі (Дж. О. Ніленс, Дж. Болдуін, Р. Райт, Л. Джонс, Р. Элісан і інш.). У жанры фантастыкі працуюць Р. Брэдберы, А. Азімаў, Р. Шэклі. Сярод паэтаў 20 ст. вылучаліся Э. Л. Мастэрс, К. Сэндберг, Р. Фрост, Э. Каммінгс, А. Мак-Ліш, Р. Лоўэл; сярод драматургаў — Ю. О'Ніл, Л. Хелман, А. Мілер, Т. Уільямс, Э. Олбі. Пенат. пісьменнікі, якія раней прытрымліваліся прагрэс. погляду, у 60-я г. пад уплывам імперыял. прапаганды перайшлі на рэакц. пазіцыі: Стэйнбек выступіў з апраўданнем амер. агрэсіі ў В'етнаме, Мілер стаў вашчальнікам сіяніяму.

На бел. мове асобнымі выданнямі выйшлі «Маленькі старацель» (1940) Ф. Б. Гарта; «Прыключэнні агітатара» (1930) М. Голда; «Трое нарасхват» (1938) У. Дыснея; «Аповні в магічан» (1940)

Ф. Купера, «Спеў аб Гайаваце» (1969) Г. У. Лангфела; «Белы Ікол» (1932, пад назвай «Белы Клык» 1939), «Бук — паштовы сабака» (1930), «Забаставаў» (1931), «Куслі» (1931), «Незвычайны адрывак» (1926), «Сказание аб Кішы» (1938), «Смок Белью» (1947) Дж. Лондана; «Прыгоды Гекльберы Фіна» (1937), «Прыгоды Тома Соера» (1935, 1939), «Прынц і жабрак» (1940) М. Твэна; «Дзесяць дзён, якія ўзварухнулі свет» (1930) Дж. Рыда; «Аўтамабільны кароль» (1939), «Злодзей» (1930), «No pasaran! — Яны не пройдуць» (1938) Э. Сінклера. У перыяд. друку паяўляюцца пераклады твораў Ф. Баноскі, Р. Брэдберы, М. Голда, Г. У. Лангфела, Дж. Лондана, Э. Колдуэла, А. Мальца, У. Уітмена, Р. Фроста, Л. Х'юза, Э. Хемінгуэя і інш.

Архітэктура. З дзюніх часоў на тэр. ЗША развівалася маст. культура індзейскіх плямёнаў. З прыходам каланізатараў паявіліся спрошчаныя, стрыманыя формы еўрап. архітэктуры 17—18 ст. У канцы 18 — пач. 19 ст. забудоўваюцца гарады (Нью-Йорк і інш.), якія атрымліваюць рэгулярную планіроўку (Вашынгтон, арх. П. Ш. Ланфан). Усталяваўся варыянт класіцызму, які вызначаўся прастатой формаў (арх. Дж. Хобан, Ч. Балфінч, Б. Х. Латроб). Інтэнсіўнае развіццё капіталізму ў 20—50-я г. 19 ст. выклікала хуткі рост гарадоў. У архітэктуры ўзнікае імкненне да грандыёзнасці і паказных эфектаў, а потым эклектычнае перайманне еўрап. стыляў мінулага (арх. Т. Уолтэр, Р. Мілс, У. Стрыкленд). Пасля грамадз. вайны 1861—65 развіваецца тэхніка буд-ва (найб. значныя архітэктары — Х. Рычардсан і Л. Салівен, які шукаў арх. рашэнні, арганічна звязаныя з выкарыстаннем стальных каркасных канструкцый). Тэхн. прагрэс і рост цэн на зямлю ў Нью-Йорку і ў інш. гарадах абумовілі масавае буд-ва з канца 19 ст. небаскробаў, што ператварылі вуліцы ў вузкія шчыліны. Суперэчлівая складанасць сучаснай амер. архітэктуры, якая адлюстроўвае сац.-эканам. структуру амер. грамадства, узмацнялецца глыбокім разрывам паміж масавай і т. зв. элітарнай культурай. Адсутнасць глыбокіх гістар. каранёў, беднасць уласных традыцый архітэктура ЗША замяняе шырокім імпартам і перайманнем іншаземных узораў. У 20 ст. ў ЗША ўзнікаюць новыя кірункі ў архітэктуры, гэтаму садзейнічала перасяленне ў ЗША вядомых еўрап. майстроў. В. Гропіус, Р. Нойтра, Л. Міс ван дэр Роэ, М. Броер, У. Харысан, Л. Скідмар распрацавалі прынцыпы функцыяналізму ў буд-ве рознага прызначэння; Ф. Л. *Райт* стварыў канцэпцыю *арганічнай архітэктуры*; Эра Саарынен, М. Ямасакі, Р. Б. Фулер і інш. распрацоўвалі новыя матэрыялы і выразныя прасторавыя канструкцыі. Аднак пошукі амер. архітэктараў адзначаны індывідуаліст. самавольствам ці вяртаннем да парадных класічных прыёмаў кампазіцыі (Э. Стоўн, Ф. Джонсан). Іл. гл. на ўклейках да гэтага арт. і арт. *Архітэктура*.

Выяўленчае мастацтва. На тэр. ЗША развівалася самабытнае мастацтва індзейцаў (драўлянная паліхромная скульптура, роспіс керамічных вырабаў, скур бізонаў). З прыходам еўрапейцаў яно паступова знікала. У 17 ст. пачаў развівацца жывапіс, пераважна мастацтва партрэта, якое набыло з сярэдзіны 18 ст. яркасць індывідуальнай характарыстыкі (Дж. Коплі, Б. Уэст). Вайна за незалежнасць выклікала ўздым мастацтва ЗША (Г. Сцюарт, Ч. Піл, Т. Салі, Дж. Трамбал). У 1-й пал. 19 ст. побач з афіц. жывапісам, поўным пампезнасці і вонкавага рамант. пафасу (С. Морзе), і рамант. пейзажам т. зв. школы р. Гудзон (Т. Коўл, А. Дзьюранд) расце простае шчырае рэаліст. мастацтва (Дж. К. Бінгем, У. Маўнт і Дж. Адзюбон). Развіццё дэмакр. грамадскіх сіл, выкліканае грамадз. вайной 1861—65, садзейнічала вылучэнню найб. значных рэалістаў ЗША: жывапісцаў У. Хомера, Т. Екінса і Дж. *Уістлера*, скульптара О. Сент-Годэнса. Аднак пераважала салоннае мастацтва, а ў канцы 19 ст. паявіўся поўны эмрочнай фантастыкі сімвалізм (А. П. Райдэр). З пач. 20 ст. вызначальнае месца ў маст. жыцці ЗША належыць мадэрнізму, які служыць імперыял. рэакцыі, адмаўляе пазнавальную і грамадскую ролю мастацтва, падмяняе яго трукцтвам, разбурае рэаліст. форму. Афіцыйна прызнаны ў 30-я г. «рэджыяналісты» (Г. Вуд, Т. Х. Бентан), якія ўслаўляюць бурж.-мяшчанскі «амерыканскі лад жыцця». Пад сярэдзіну 20 ст. з падтрымкай капіталіст. мецэнатаў і прэсы ЗША сталі гал. цэнтрам сюррэалізму (С. Далі, Іў Тангі) і абстрактнага мастацтва (Дж. Полак, М. Тобі, А. Колдэр), а потым найноўшых бурж. мадэрнісцкіх плыняў — т. зв. «поп-арта» (Р. Раўшэнберг, Дж. Сегал), «оп-арта» і інш. У жорсткай барацьбе з гэтымі антыдэмакр. і антыгуманіст. плынямі развіваецца рэаліст. мастацтва. У пач. 20 ст. рэаліст. традыцыі працягвалі Р. Хенры, Дж. Белаўз, Дж. Лакс, Дж. Слоўн, Дж. Г. Барнард. Пасля 1917 паявілася баявая паліт. графіка, звязаная з прагрэс. прэсай (Р. Майнар, Ф. Эліс, У. Гропер, А. Янг); развіццё перадавых рэаліст. тэндэнцый звязана таксама з творчасцю жывапісцаў і графікаў Р. *Кента*, Э. Хопера, Э. Уэсса, А. Рэфрэн'е, братоў Р. і М. Соерэў, Дж. Левіна, Ч. Уайта, скульптараў Дж. Эпстайна, У. Зораха. Іл. гл. на ўкл.

Музыка. Творчасць амер. кампазітараў вырасла на аснове ўзаемадзеяння муз. культур індзейцаў, неграў, каланізатараў і імігрантаў з Еўропы. Найб. значныя ў амер. музыцы традыцыі негрыцянскага песеннага і танц. фальклору (спірычуэл, блюз, рэгтайм і інш.). Прафесійная муз. культура ЗША пачала складвацца ў апошняй чвэрці 18 ст. Першы амер. кампазітар — Ф. Хопкінсан, аўтар равалюц. песень, кантат, опер; хар. гімны і песні пісаў У. Білінгс. З вандроўным «Тэатрам менестраляў» (папулярны ў 1861—65) звязана дзейнасць аўтара лірычных гарадскіх песень С. К. Фостэра. Ісп. і крэольскі фальклор адлюстраваны ў фп. творчасці першага амер. піяніста Л. М. Готшалка (2-я пал. 19 ст.). У 60-я г. 19 ст. арганізаваны сімф. аркестры, муз.-навуч. ўстановы і т-ры. На музычнай культуры краіны на мяжы 19—20 ст. адбілася еўрапейская арыентацыя мецэнатаў, якія фактычна кіравалі музычным жыццём. Многія амер. кампазітары вучыліся ў Германіі і Францыі і неслі ў музыку ЗША перайманне еўрап. узораў. Сярод кампазітараў канца 19 — пач. 20 ст.— Дж. Пейн, Дж. Чэдуік, А. Фут. Заснавальнік амер. прафесійнай кампазітарскай школы Э. *Мак-Доўэл*; ён першы выкарыстаў індзейскі муз. фальклор. На фальклорным матэрыяле пабудаваны таксама творы Г. Гілберта, Ч. Кэдмена і інш. Вял. значэнне для развіцця нац. прафесійнай школы ЗША мела кампазітарская і пед. дзейнасць А. Дворжака (у 1892—95 дырэктар Нац. кансерваторыі ў Нью-Йорку). У пач. 20 ст., і асабліва пасля 1-й сусв. вайны, пашырыўся *джаз*. Узніклы як імправіз. форма негр. нар. песень і танцаў, ён вылучыў у 20—30-я г. шэраг прафес. майстроў (Э. К. Эліінгтан, Л. Армстранг, Б. Д. Гудмен і інш.). Пачынаючы

А. Рэфрэн'е. Землетрасенне і пажар у Сан-Францыска ў 1905. Насценны роспіс паштамта Рынкан Пост Офіс у Сан-Францыска. 1946—47.



з 20-х г. кампазітары У. Пістан, Р. Харыс, А. Копленд, Дж. Антэйл, Э. Сігмейстэр і інш. імкнуцца да сцвярджэння нац. стылю, пошукі якога спалучаліся ў іх з ужываннем дасягненняў еўрап. класічнай і рамант. музыкі, найноўшага франц. мастацтва (імпрэсіяністы, кампазітары «шасцёркі»). Пазней гэтыя кампазітары шырока выкарыстоўвалі, побач з нар. мелодыямі, прыёмы джаза. Ч. Айвс спалучаў фальклор з тэхнікай атанальнага і політанальнага пісьма. Дэгуманізацыя музыкі выявілася ў урбаністычных творах Дж. Кармпетэра (балет «Небаскробы» з ужываннем мех. інструментаў). На аснове сімфанізацыі джаза Дж. *Гершвін* стварыў нац. оперу «Поргі і Бэс» на сюжэт з жыцця амер. неграў, праслянутую спачуваннем да абяздоленых. Пасля 2-й сусв. вайны пашырыўся і астаецца папулярны м'юзікл, спецыфічна амер. разнаіднасць муз. камедыі (Гершвін, Р. Роджэрс, Ф. Лоў, Л. Бернстайн і інш.). У 30-я г. ў музыцы ЗША ўзмацняецца барацьба кірункаў, расце творчая актыўнасць прагрэс. маладых кампазітараў, якія групуюцца вакол «Лігі кампазітараў» (1923—54) і «Рабочай музычнай лігі» (з 1931) у Нью-Йорку; у творах Копленда, Сігмейстэра, М. Бліцстайна, Э. Робінсана, Дж. Шэфера і інш. адлюстравана рабочая і рэвалюц. тэматыка. Пасля 2-й сусв. вайны выразна азначыліся антыдэмакр. авангардысцкія тэндэнцыі, якія выявіліся пераважна ў фармальным эксперыментатарстве. Валюніча суб'ектывісцкае, заснаванае на адмове ад актыўнай грамадскай функцыі мастацтва найноўшых авангардыстаў знаходзіць сабе багатых апекуноў, але не карыстаецца поспехам у шырокай аўдыторыі. Вялікі ўклад у развіццё муз. выканальніцтва ЗША зрабілі выхадцы з Еўропы, пераважна з Расіі (С. Рахманінаў, Р. Пяцігорскі, М. Эльман, Я. Цымбаліст, С. Кусявіцкі, Л. Аўэр, Я. Хейфец і інш.). У час 2-й сусв. вайны ў ЗША эмігравалі з Еўропы найб. вядомыя кампазітары — І. Стравінскі, А. Шонберг, П. Хіндэміт, Б. Бартак. Сярод сучасных музыкантаў вылучаюцца кампазітары С. Барбер, Дж. К. Меноці, Р. Сешнс, У. Г. Стыл, У. Шуман, кампазітар і прапагандыст фальклору П. Сігер, спявачкі М. *Андэрсан*, М. Добс, Л. Прайс (негрыцянкі). Муз. жыццё супярэчлівае. У краіне больш за 60 прафесійных сімф. аркестраў, але стацыянарных оперных т-раў толькі 4 (найб. значны «Метраполітэн-опера» ў Нью-Йорку, з 1883). Канцэртнае жыццё кантралюецца камерцыйнымі арг-цыямі, якія стымулююць пераважна развіццё развесляльнага мастацтва. Многія муз. школы і кансерваторыі прыватныя.

Тэатр. У 17 ст. еўрап. місіянеры наладжвалі паказы містэрый. У 1751 у Уільямсбурзе (Віргінія) Л. Халем арганізаваў першую прафес. тэатр. трупу. У час вайны за незалежнасць тэатр. паказы забараняліся. Адналіла дзейнасць трупа Л. Халема-малодшага ў 1785 (Нью-Йорк). У 20—30-я г. ў Нью-Йорку, Бостане, Філадэльфіі і інш. ствараюцца т-ры, будуюцца тэатр. памяшканні. У 1-й пал. 19 ст. фарміруецца нац. акцёрская школа. У 2-й пал. 19 ст. колькасць т-раў павялічылася, але былі яны пераважна вандроўнымі (папулярныя «плывучыя т-ры» па р. Місісіпі). Сярод акцёраў 19 ст.— М. Адамс, сям'я Барымараў, Дж. Бутс, Дж. Джэферсан, Ш. Кашмен, Дж. Марла, А. *Олдрыдж*, М. Фіск, Э. Форэст. У 50—60-я г. антрэпрэнёры ці вядучыя артысты вандроўных труп набіралі акцёраў для пастаноўкі адной п'есы. Такая практыка садзейнічала ўзнікненню ў пач. 19 ст. сістэмы «зорак», якая канчаткова замацавалася на мяжы 19—20 ст. Гэтая сістэма адмоўна адбівалася на акцёрскім мастацтве, парушала ансамбль, высокія ганарары «зоркам» выплачвалі за кошт скарачэння сумы на пастаноўку. У 19—20 ст. з развіццём манапаліст. капіталу паяўляюцца т-ры, якія належаць тэатр. трастам. Маленькія т-ры, не вытрымліваючы канкурэнцыі трастаў, дэградуюць і гібнуць. У канцы 19 ст. ўзніклі камерцыйныя т-ры Брадвея (Нью-Йорк), якія атрымалі назву «брадвейныя т-ры». На мяжы 19—20 ст. прагрэс. маст. інтэлігенцыя імкнулася проціпаставіць развесляльнаму мастацтву брадвейных т-раў (ставілі муз. камедыі, вадэвілі, рэвю) больш сур'ёзны рэпертуар, увесці класічную драматургію, мець у рэпертуары некалькі п'ес (т-р Д. Беласка). Найб. значнай і прагрэсіўнай была дзейнасць т. зв. малых т-раў (узніклі ў 1-м дзесяцігоддзі 20 ст.). Яны арыентаваліся на шырокага дэмакр. гледача, папулярызавалі класіку, прагрэс. нац. творы, вялі барацьбу з камерцыйнымі т-рамі Брадвея, з іх пошлым бездухоўным рэпертуарам: т-ры «Провінстаўн плеерс» (1915), «Вашынгтон Сквер плеерс» (1915, з 1919 «Гілд-тыэтр») і інш. Сярод дзеячаў малых т-раў: драматургі Дж. Лоўсан, Ю. О'Ніл, С. Хоўард, рэжысёры Э. Казан, Х. Клермен, Р. Мамуллян, Лі Страсберг, акцёры Дж. Барымар, Е. Ле Гальен, К. Корнел, Л. Фонтан. У 1927 узнік «Т-р новых драматургаў», які адыграў значную ролю ў развіцці перадавога тэатр. мастацтва. Стала папулярнай група Дж. Рыда ў Філадэльфіі. Узнікалі агіт-прапгрупы, стацыянарныя рабочыя т-ры. Вял. значэнне для развіцця рабочага т-ра мела Усеамер. алімпіяда (1932), пасля якой сфарміравалася Ліга рабочых т-раў. Значны ўплыў на развіццё амер. прагрэс. т-ра зрабілі гастролі МХАТа ў 1923—24. У гады эканам. крызісу 1929—33 колькасць т-раў скарацілася. У 1935 узніклі першыя дзярж. т-ры ЗША — федэральныя. За прагрэс. накіраванасць у 1939 федэральныя т-ры абвінавачаны ў антыамер. дзейнасці і забаронены. Пасля 2-й сусв. вайны палітыка «халоднай вайны» затрымлівала развіццё перадавога мастацтва. Ставіліся пераважна муз. камедыі і агляды, рэвю. У пач. 50-х г. узніклі т-вы «Новыя драматургі», «Нар. акцёры» і інш., якія ставілі прагрэс. сучасныя творы. Адраджаюцца і ўзнікаюць аматарскія і прафес. тэатр. трупы, якія процістаяць паліт. рэакцыі. Ле Гальен і М. Уэбстэр заснавалі «Амер. рэпертуарны т-р» (1946), адкрыўся першы Шэкспіраўскі т-р (1955). Як і раней, Нью-Йорк — цэнтр тэатр. жыцця. Паявіўся тэрмін «па-за Брадвеем» (off Broadway) у дастасаванні да т-раў, якія процістаяць мастацтву Брадвея («пазабрадвейныя т-ры» — «Крыкет», «Грынуіч-М'юз», «Шэрыдан Сквер плейхаўз» і інш.). Яны працуюць у невял. памяшканнях, ставяць класічныя і сучасныя п'есы, якіх не прызнае Брадвей, выступаюць супраць сістэмы «зорак»; іх спектаклі даступныя прац. насельніцтву (кошт білетаў невысокі). У 1957 у Нью-Йорку арганізавана Ліга «пазабрадвейных т-раў». Аднак адсутнасць дакладнай накіраванасці творчасці зніжае грамадз. значэнне гэтых т-раў (у 60-я г. ператварыліся ў камерцыйныя прадпрыемствы), у іх рэпертуар трапляе ўпадніцкая драматургія, пераважаюць м'юзіклы, развесляльныя паказы, псіхапаталагічныя драмы. Адначасова ўзмацняецца праяўленне перадавых тэндэнцый у камерцыйным брадвейным т-ры. У 60-я г. адбываецца працэс збліжэння т-раў Брадвея і «пазабрадвейных т-раў». У 1964 у Нью-Йорку адкрыўся Пастаянны т-р Лінкальнскага цэнтра мастацтваў. Ле Гальен узначаліла «Нац. т-р». Узмацняецца значэнне невял. аматарскіх паўпрафес. і прафес. т-раў, якія развіваюць традыцыі малых т-раў. У канцы 60-х г. узмацніліся супярэчнасці ў амер. т-ры — з аднаго боку, палітызацыя (т-ры становяцца цэнтрам пратэсту супраць паліт. і сац. парадкаў у ЗША — «Лівінг-тыэтр», «Брэнд энд Папет») і з другога — праяўленне антыгуманіст. формаў (жорсткасць, паталагічны секс).

Кіно. Кінавытворчасць у ЗША ўзнікла ў 1896. Першыя значныя фільмы стварыў рэж. і аператар Э. Портэр. З 1909—10 здымкі рабілі ў Галівудзе, які стаў з 1919 цэнтрам і сінонімам амер. кінематаграфіі, у 20-я г. заваяваў манапольнае становішча на сусв. кінарынку. Рэжысёры Д. У. *Грыфіт*, Т. Х. Інс, М. Сенет прынеслі кіно ЗША сусв. вядомасць. Папулярныя салонныя камедыі, гістар. «баевікі» і псеўдарамант. драмы з удзелам «кінозорак» — Р. Валентына, М. Пікфард, Д. Фэрбенкса. Рэжысёры-рэалісты Э. Штрогейм, Ч. *Чаплін*, Дж. Крузе, К. Відар, Р. Флаэрці і іх фільмы прыгняталіся кіраўніцтвам Галівуда. Увядзенне гуку (1926) прывяло да канчатковай манапалізацыі вытворчасці ў руках фірмаў, моцна звязаных з буйнымі банкамі. Фільмы 30 — пач. 40-х г. Дж. Форда, У. Уайлера, Ф. Капры, О. Уэлса, Ч. Чапліна вылучыліся сац. вастрынёй і значнасцю праблем. Дасягнула поспехаў мультыплікац. кіно (творчасць У. *Дыснея*). У 2-ю сусв. вайну рэжысёры Л. Майлстаўн, Ф. Цышеман, Х. Хокс і інш. імкнуліся раскрыць сац. і паліт. значэнне вайны з фашызмам. Пасля вайны пашырыліся рэакц. тэндэнцыі. У выніку «чысткі» Галівуда ад прагрэс. элементаў, якую ў 1947 распачала Камісія па расследаванні

антыамер. дзейнасці, стаў немагчымы выпуск фільмаў, прысвечаных праблемам грамадскага жыцця. Ствараюцца прафашысцкія, антыкамуніст. фільмы, накіраваныя супраць СССР, краін нар. дэмакратыі і прагрэс. сіл ЗША. Найб. папулярныя сярод камерцыйных фільмаў — псіхапаталагічныя драмы і дэтэктыўныя фільмы А. Хічкака. У канцы 40-х г. пачаўся крызіс Галівуда, выкліканы ніжэйшым маст. узроўнем фільмаў, іх рэакц. накіраванасцю, рамесніцка-стандартнымі штампамі кінадраматургіі, рэжысуры і акцёрскага выканання. Спробы пераадолець крызіс увядзеннем тэхн. навін не дасягнулі мэты. У сярэдзіне 50-х г. рэжысёры Д. Ман, С. Люмет і інш. звяртаюцца да паказу жыцця звычайнага амерыканца. Значныя фільмы стварыў С. *Крамер*, які аналізуе вострыя праблемы грамадскага і духоўнага жыцця. У канцы 50-х г. у Нью-Йорку і Чыкага ўзнікла група «Новае амер. кіно» (Д. Мекас, Ш. Кларк, Дж. Касаветэс, Л. Рагозін), якая стандартнаму камерцыйнаму кіно супастаўляе фільмы з вострай сац. праблематыкай. У 60-я г. большасць кінафірмаў здымае фільмы для тэлебачання, фільмы-«калосы», гангстэрскія і каўбойскія баевікі, развесляльную прадукцыю. Асабліва пашыраны парнаграфічныя, эратычныя і сексуальныя фільмы. Секс, насілле, індывідуалізм, садызм у кіно сталі сродкам духоўнага разбэшчвання грамадства, прапаганды амер. ладу жыцця. Асобны рэж. (А. Пен, М. Нікалс і інш.) імкнуцца асэнсаваць надзённыя для ЗША праблемы — расізм, вайну ў В'етнаме, пытанні фарміравання светапогляду моладзі, ролю чалавека ў грамадстве. Сярод відомых акцёраў кіно — Х. Богарт, М. Бранда, Н. Вуд, Г. Гарба, К. Гейбл, М. Дытрых, Б. Дэйвіс, Г. Купер, Б. Ланкастэр, Ш. Мак-Лейн, Ф. Марч, М. Манро, П. Н'юмен, Т. Паўэр, С. Трэсі, Г. і Дж. Фонда.



Кадр з фільма «Малыш», 1920. Рэж. Ч. Чаплін.

Літ.: Ленін У. І. Пісьмо да амерыканскіх рабочых. [20.VIII.1918], Тв., т. 28 (Полн. собр. соч., т. 37); Фарамазян Р. А. США. Милитаризм и экономика, М., 1970; Игнатьев Г. М. Северная Америка. Физическая география. М., 1965; Экономические районы США. Север, М., 1958; Половицкая М. Е. Экономические районы США. Юг, М., 1956; Леж. Экономические районы США. Запад, М., 1966; Ефимов А. В. Очерки истории США. От открытия Америки до окончания гражданской войны, 2 изд., М., 1958; Ягож. США. Пути развития капитализма (доимпериалистическая эпоха), М., 1969; Лан В. И. США в военные и послевоенные годы (1940—1960), М., 1964; Очерки новой и новейшей истории США, т. 1—2, М., 1960; Яковлев Н. Н. Новейшая история США, М., 1961; США: от «великого» к больному..., М., 1969; Беглов И. И. США: собственность и власть, М., 1971; Белявская И. А. Буржуазный реформизм в США (1900—1914), М., 1968; Зубок Л. И. Экспансионистская политика США в начале XX в., М., 1969; Дмитриев Б. США: политики, генералы, дипломаты, М., 1971; Фостер У. Очерк политической истории Америки, пер. с англ., М., 1953; Фонер Ф. История рабочего движения в США, пер. с англ., т. 1—4, М., 1949—69; История рабочего движения в США в новейшее время, т. 1, М., 1970; Бойченко Г. Г. Политическая организация США, Мн., 1970; Зорин В. Некоронованные короли Америки, 3 изд., М., 1970; Проблемы литературы США XX века, М., 1970; Проблемы истории литературы США, М., 1964; Засурский Я. Н. Американская литература XX века, М., 1966; Николюкин А. Н. Американский романтизм и современность, М., 1968; Самохвалов Н. И. Американская литература XIX в., М., 1964; Современное литературоведение США. Споры об американской литературе, М., 1969; Орлова Р. Д. Потомки Гекльберри Финна. Очерки современной американской литературы, М., 1964; Паррингтон В. Л. Основные течения американской мысли, пер. с англ., т. 1—3, М., 1962—63; Мумфорд Л. От бревенчатого дома до небоскреба. Очерк истории американской архитектуры, пер. с англ., М., 1936; Христиани А. М. Новейшая архитектура США (1945—1960), М., 1963; Чегодаев А. Д. Искусство Соединенных Штатов Америки от войны за независимость до наших дней, М., 1960; Жуков Ю. Из боя в бой. Письма с фронта идеологической борьбы, М., 1970; Модернизм. Анализ и критика основных направлений. [Сб. арт.], М., 1969; Кино, театр, музыка, живопись в США, М., 1964; Конен В. Пути американской музыки, 2 изд., М., 1965; Карцева Е. Сделано в Голливуде, М., 1964; Теплиц Е. Кино и телевидение в США, пер. с польск., М., 1966; Звезды немого кино. Сб., М., 1968.

В. А. Жучкевіч (прырода). Мінск; *В. М. Гохман* (пасельніцтва, гаспадарка). Масква; *Л. М. Шнеерсон* (гістар. нарыс да 1918), *Д. Б. Мельцэр* (гістар. нарыс з 1918). Мінск; *З. К. Навокіна* (асвета). Масква; *Г. К. Навіцкі* (навуковыя ўстановы). Мінск; *А. М. Нікалюкін* (літаратура), *У. А. Уціцаў* (кіно). Масква.

ЗЛУЧЭ́ННІК (у граматыцы), службовае слова ці спалучэнне слоў, якое злучае члены сказа, часткі складанага сказа ці цэлыя сказы. Як і інш. службовыя словы, самастойнага лексічнага значэння не мае.

У сучаснай бел. мове З. падзяляюцца: паводле марфалаг. складу — на простыя (невытворныя «а», «і», «ды», «бо», «ці», вытворныя «што», «толькі», «або», «аж», «дый») і састаўныя («таму што», «як быццам», «для таго каб»); паводле сінтакс. функцыі — на злучальныя (звязваюць раўнапраўныя сінтакс. адзінкі) і падпарадкавальныя (звязваюць сінтакс. адзінкі, з якіх адна паясняе другую). Сярод злучальных вылучаюцца спалучальныя («і», «ды», «дый», «таксама»), супастаўляльныя («а», «але», «ды», «аднак») і пералічальна-размеркавальныя («ці-ці», «ні-ні», «то-то»); сярод падпарадкавальных — часавыя («калі», «пакуль», «як толькі»), умоўныя («калі б», «каб», «раз»), прычынныя («бо», «таму што»), мэтавыя («каб», «абы», «для таго каб»), уступальныя («хоць», «нягледзячы на», «нягледзячы на тое што»), выніковыя («так што») і параўнальныя («як», «быццам», «нібыта»). У ролі З. бываюць і злучальныя словы — займеннікі і прыслоўі («які», «дзе», «што»).

Літ.: Граматыка беларускай мовы, т. 1 — Марфалогія, Мн., 1962.


П. П. Шуба. Мінск.

ЗЛУЧЭ́ННЕ ВАЙСКО́ВАЕ, вышэйшае вайсковае фарміраванне, пераважна пастаяннага складу, прызначанае для выканання складаных баявых задач і сумесных вучэнняў у мірны час. Да пастаянных З. в. адносяцца: *корпус, дывізія, брыгада*, а таксама *эскадра* (ВМФ).

ЗЛУЧЭ́ННІ (у матэматыцы), мноствы, якія складзены з *n* элементаў па *m* элементаў у кожным. Адрозніваюць тры віды З.: размяшчэнні, перастаноўкі, спалучэнні. Гл. *Камбінаторыка*.

ЗЛУЧЭ́ННІ (у тэхніцы), вузлы канструкцый, асобныя часткі якіх злучаны паміж сабою. Складаюцца з сумежных дэталяў (напр., фланцаў) і дэталяў, што іх злучаюць (напр., заклёпак). Прызначаны перадаваць намаганні ад адной дэталі да другой.

Адрозніваюць дзве асн. групы З.: раздымныя і нераздымныя (гл. рыс.). Да раздымных належаць



разьбовыя *а* (гл. таксама *шпількавае злучэнне*), шпоначныя *б*, зубчастыя (шліцавыя), профільныя, клінавыя *в*; іх можна разбіраць і зноў збіраць, не баючыся разбурыць ці істотна пашкодзіць злучальныя дэталі. Да нераздымных належаць заклёпачныя *г*, зварныя, клееныя (гл. *Клапанныя канструкцыі*, *Зварныя канструкцыі*, *Клееныя канструкцыі*); іх пельга разабраць, каб злучальныя дэталі пры гэтым не разбурыліся. Прамежкавыя паміж раздымнымі і нераздымнымі — З. з гарантаваным нацягам, у якіх сілы (ці моманты сіл) перадаюцца ад адной дэталі да другой сіламі трэння, што ўзнікаюць на паверхні кантакту дэталяў. Пры разборцы такіх З. паверхні кантакту звычайна пашкоджваюцца, і пры паўторнай зборцы надзейнасць З. зніжаецца. З. падзяляюцца таксама на перухомыя і рухомыя; у апошніх, напр. шліцавых, дэталі могуць рухацца ў восевым напрамку пры пазменнасці ўзаемнага размяшчэння ў радыяльным і акружным напрамках.

Літ.: Иванов М. Н. Детали машин, 2 изд., М., 1967; Решетов Д. Н. Детали машин, 2 изд., М., 1963; Детали машин в примерах и задачах, под ред. С. М. Башеева, Мн., 1970.

Б. С. Мельнікаў. Мінск.

ЗЛЫДНІ, 1) паводле старадаўніх беларускіх і украінскіх народных павер'яў пячыстая сіла, увасабленне напасці, бяды, нягоды, якія напалі на чалавека, яго сям'ю, гаспадарку. Уяўляліся ў вобразе нябачных старых — старцаў. Лічылася, дзе яны пасяляюцца, там вечна будзе беднасць: «Упраціліся злыдні на тры дні, а і ў тры гады не выжывеш». 2) Бедныя, немаёмныя людзі.

ЗЛЫ́НАЎ Георгій Васілевіч [н. 9(22).2.1909, в. Кабанаўка Рэчыцкага пав. Магілёўскай губ.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1932. У 1931—34 у Чырв. Арміі. З 1935 на сав. і парт. рабоце. У Айч. вайну ўдзельнік абароны Жлобіна. У партызанах з кастр. 1942 — палітрук узвода, роты, камісар атрада, з 11.9.1943 камісар *партызанскай брыгады «Жалязняк»* Гомельскай вобл. З 1946 на сав. рабоце. Жыве ў Жлобіне.

«ЗМАГА́ННЕ» (Беларуская дэпутацкая фракцыя «Змаганне за інтарэсы сялян і рабочых»), легальная рэвалюц.-дэмакр. і нац.-вызваленчая арганізацыя працоўных Зах. Беларусі. Узнікла па ініцыятыве ЦК КПЗБ у снеж. 1927 як выбарчы рабоча-сялянскі к-т «Змаганне» па падрыхтоўцы да выбараў у сейм. У выніку выбараў, што адбыліся 4.3.1928 у абставінах жорсткіх рэпрэсій, ад працоўных Зах. Беларусі ў сейм прайшлі толькі 5 дэпутатаў: І. С. *Дварчанін*, І. Е. Гаўрылік, Ф. І. *Валынец*, І. М. *Грэцкі*, А. Стагановіч (у лют. 1929 яго замяніў П. С. *Крынчык*). Яны стварылі ў сейме бел. рабоча-сялянскі пасольскі клуб «Змаганне», які цесна супрацоўнічаў з камуніст. фракцыяй сейма і фактычна быў парламенцкай фракцыяй КПЗБ. Дзейнасцю клуба кіраваў упаўнаважаны ЦК КПЗБ Г. М. Муха-Мухноўскі (Юрка). Аб'яднаўшы шматлікі актыў, што вырас у *Беларускай сялянска-рабочай грамадзе*, і стварыўшы вясной 1929 амаль ва ўсіх паветах мясцовыя сакратарыяты, «З.» стала ўплывовай паліт. арг-цыяй працоўных Зах. Беларусі, змагалася за тыя ж патрабаванні, што і яе папярэдніца — Грамада. Пасольскі клуб «З.» і яго сакратарыяты былі цэнтрамі легальнай паліт. дзейнасці КПЗБ сярод шырокіх мас. Яны арганізоўвалі мітынгі, сходы, дэманстрацыі працоўных, змагаліся супраць бел. бурж. нацыяналіст. партый, падтрымлівалі дзейнасць *Таварыства беларускай школы*, з трыбуны сейма выкрывалі антынародную палітыку бурж.-памешчыцкага ўрада, адстойвалі інтарэсы рабочых і сялян, патрабавалі дапамогі тым, хто галадаў, выступалі ў абарону паліт. вязняў. «З.» выдавала легальныя газеты нац.-вызв. кірунку: *«На варце»*, «Свет», «Світанне», *«Да працы»*, «Праца», «Голас працы», «Наша газета» і інш. (рэдактары А. Войцік, Я. Міско, Я. Мазоль, Н. Марцінчык, Кур'янка). 30.8.1930 фаш. ўлады арыштавалі дэпутатаў сейма і кіраўнікоў «З.» і неўзабаве ліквідавалі ўсе 50 мясцовых сакратарыятаў. Паводле прыгавору суда над кіраўнікамі і актывістамі «З.», які адбыўся ў Вільні (1931), Дварчанін, Гаўрылік, Валынец і Крынчык прыгавораны да 8 гадоў турмы кожны.

Літ.: Революционный путь Компартии Западной Белоруссии, Мн., 1966, с. 157, 173—197, 225—232; У суровый годы подполья, Мн., 1958, с. 161—167.

І. П. Хайратовіч. Мінск.

«ЗМАГА́ННЕ», газета левага нац.-вызваленчага кірунку ў бел. нац. руху ў Зах. Беларусі. Выдавалася левым сацыяліст. крылом Бел. нац. фракцыі польскага сейма. Выходзіла легальна ў Вільні з 28.10.1923 да 31.1.1924 на бел. мове. Абараняла інтарэсы прац. сялянства Зах. Беларусі, крытыкавала палітыку нац. ўціску ў бурж. Польшчы, выступала за школу на роднай мове, за развіццё бел. культуры. Асвятляла дзейнасць левай фракцыі *Беларускага пасольскага клуба*, заклікала левых сацыяліст. дэпутатаў гэтага клуба выдзеліцца з яго складу і стварыць самастойны клуб, абараняла бел. культуру ад нападак польскай рэакц. прэсы, друкавала этнагр. матэрыялы пра побыт і духоўную культуру зах.-бел. вёскі. Інфармавала пра жыццё Сав. Беларусі, ухваляла клопаты ўрада БССР аб развіцці нац. культуры, мастацтва і асветы. Выйшаў 31 нумар, 2 з іх канфіскаваны. Закрыта польскімі ўладамі.

У. А. Калеснік. Брэст.

ЗМАЗА́ЧНЫЯ МАТЭ́РЫЯЛЫ, прадукты перапрацоўкі нафты (радзей жывёльнае масла і алей), некаторыя цвёрдыя і газападобныя рэчывы, якія ўжываюцца як змазка і ў інш. тэхн. мэтах. Найб. важныя фіз.-хім. паказчыкі З. м.: вязкасць, попельнасць, каксоўнасць, т-ры ўспышкі і застывання, стабільнасць супраць акіслення.

Адрозніваюць 4 асноўныя групы З. м.: вадкія, пластычныя, цвёрдыя і газападобныя. З вадкіх найб. пашыраны *мінеральныя маслы*: для змазкі рухавікоў унутр. згарання (маторныя: авіяцыйныя, аўтатрактарныя і дызельныя), станкоў і прылад (індустрыяльныя, прыладавыя), цяжканагружаных механізмаў (трансмісійныя, восевыя), паветраных кампрэсараў і халадзільных машын (кампрэсарныя); выкарыстоўваюцца ў тэхнал. мэтах (электраізаляцыйныя, абсарбенты, гартавальныя вадкасці). Пластычныя (кансістэнтныя) З. м.— сумесі мінер. масла з кальцыевымі ці натрыевымі мыламі (салідол, канталін). З цвёрдых З. м. найб. пашыраны дысульфід малібдэну, графіт і політэтрафторэтылен, а газавых — пары газы, галагенвытворныя метану. Гл. таксама *Змазка*.

Літ.: Панов В. В. и Папок К. К. Смазочные масла современной техники, М., 1965; Георгиев И. Г. и Жарковский Д. В. Топливо, смазочные материалы и вода, Мн., 1963; Папок К. К. и Рагозин Н. А. Технический словарь-справочник по топливу и маслам, 3 изд., М., 1963.

ЗМА́ЗКА (у тэхніцы), падача *змазачных матэрыялаў* да паверхні слізгання ці качэння дэталяў машын, каб зменшыць між імі трэнне.

З. памяншае каэф. трэння да 0,001 (каэф. трэння нязмазаных паверхняў 0,1—0,8), зношванне і награванне дэталяў, павялічвае ккдз машын. Выбар тыпу змазачных матэрыялаў залежыць ад умоў, у якіх працуюць машыны, іх магутнасці і г. д. Найб. пашыраны мінеральныя вадкія і кансістэнтныя змазачныя матэрыялы; цвёрдыя ўжываюцца, калі т-ры высокія або вельмі нізкія, газавыя — ва ўмовах высокіх скорасцей. Для найб. эфектыўнасці З. паверхням слізгання (качэння) надаюць форму падшыпнікаў, падпятнікаў і інш. З. ажыццяўляецца ручным ці аўтам. спосабам з дапамогай маслёнак, шпрыцаў, лубрыкатараў, спец. помпаў. Выкарыстоўваецца З. таксама пры мех. апрацоўцы металаў і для аховы іх ад карозіі.

Літ.: Пономарев А. Ф. и Гедык П. К. Смазка оборудования, 2 изд., М.— Свердловск, 1962.

ЗМАЙ [Змај; сапр. Іованавіч (Јованович)] Іован (24.11.1833, г. Нові-Сад — 3.6.1904), сербскі паэт. Адзін з пачынальнікаў рэалізму ў серб. л-ры. Па адукацыі юрыст і медык. Выступіў у друку на пач. 50-х г. Аўтар зб. вершаў «Ружы» (1864), «Завялыя ружы» (1882), «Спы» (т. 1—3, 1895—1900), камедыі «Карп» (1864). Паэзія З. прасякнута нац.-вызв. ідэямі, сац.-паліт. сатырай, лірызмам. Пераклаў творы А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Някрасава, Ш. Пецёфі і інш.

Тв.: Рус. пер.— Стихотворения, М., 1958.

ЗМАЧЫ́НСКІ Міхаіл Рамanавіч (н. 14.11.1937, в. Блонь Пухавіцкага р-на БССР), перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1971). Чл. КПСС з 1961. У 1955—58 трактарыст саўгаса імя Горкага Камышынскага р-на Кустанайскай вобл. У 1958—60 слесар, з 1960 брыгадзір паляводчай брыгады племзавода «Індустрыя» Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Узнаг. ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», медалямі.



Змеегалоўнік Руйша.

ЗМЕЕГАЛО́ЎНІК (Dracocephalum), род адна- і шматгадовых травяністых раслін сям. губакветных. Вядома 45 відаў, пашыраных у Еўропе і Азіі. У СССР 38 відаў, на Беларусі тры.

Сцябло прамастойнае, выш. да 80 *см*. Лісце ланцэтна-лінейнае або сэрцападобнаавальнае. Кветкі сінія, фіялетавыя, ліловыя, сабраныя ў пазухах лісця ў несапраўдныя кальчакі. Плод — арэшак. На Беларусі вядомы: З. малдаўскі (D. moldavica), З. чабаркавецкі (D. thymiflorum), З. Руйша (D. Ruyschiana). Расце ўздоўж дарог, на лугах, палянах, у хваёвых лясах, у збожжы. Лекавыя і меданосныя расліны. З. малдаўскі культывуецца як эфіраалейная расліна.

Літ.: Флора БССР, т. 4, Мн., 1955.

ЗМЕІ (Ophidia, Serpentes), падатрад паўзуноў атр. лускаватых. Вядома каля 2700 відаў (з іх ядавітых 250), аб'яднаных у 12 сям. Найб. значныя: слепуны, удавы, *вужы*, асіпіды, марскія З., *гадзюкі*, *грымучыя змеі* і інш. У СССР 52 віды [найб. ядавітыя — кобра сярэднеазіяцкая (гл. *Кобры*), *гюрза*, эфа пістачаная, гадзюка звычайная, шчытаморднік усходні]. На Беларусі тры віды — вуж звычайны, гадзюка звычайная, *мядзянка*. Яд З. выкарыстоўваецца ў медыцыне, скура — у галантэрэйнай прамысловасці. Некат. З. (вужовы, гадзюкі) знішчаюць шкодных грызуноў.

Паходзяць З. ад варанавых яшчарак. Маюць доўгае выцягнутае цела (у некат. даўж. да 11 *м*), укрытае лускою і рагавымі шчыткамі, кароткі хвост. Канечнасцей няма (іншы раз астаюцца рудыменты). Вочы ўкрытыя зрослымі празрыстымі павекамі. Зубы вострыя, загнутыя назад (у некат. ёсць ядавітыя зубы, злучаныя з ядавітай залозай баразёнкай або ўнутраным каналам). Колер З. часцей за ўсё зялёны, жаўтавата-пясчаны, буры і г. б. Найбольшасці прыстасаваны да колеру прыроднага асяроддзя. Удавы, вужы, грымучыя змеі маюць органы тэрмалакацыі, якія ўлаўліваюць цеплавыя прамяні ад цеплакроўных жывёл. Перамяшчаюцца З. з дапамогаю гарызантальных выгінаў цела і руху брушных шчыткоў. З.— пайкілатэрмныя жывёлы (т-ра цела зменьваецца ў залежнасці ад т-ры знешняга асяроддзя), чым і абумоўлены арэал іх пашырэння (усе часткі свету, за выключэннем Антарктыды). Жывуць З. на зямлі, на дрэвах, у вадзе. Размнажаюцца на 2—5-м годзе жыцця, адкладваюць яйцы, ёсць яйцажывародныя (марскія З., гадзюкі, грымучыя З.). Кормяцца малюскамі, наземнымі, рыбаю, земнаводнымі, дробнымі паўзунамі, птушкамі і млекакормячымі. Ядавітыя З. небяспечныя для людзей і свойскай жывёлы. Некат. ядуць ікру і малявак рыб. Іл. гл. на ўкл.

Літ.: Жизнь животных, т. 4, ч. 2, М., 1969; Терентьев П. В. Герпетология, М., 1961; Фауна и экология наземных позвоночных Белоруссии, Мн., 1961; Талызин Ф. Ф. Змеи, М., 1963.

Т. М. Курскова. Мінск.

ЗМЕ́НЛІВАСЦЬ (у біялогіі), паяўнасць або паяўленне адрозненняў паміж арганізмамі ў марфалагічных, фізіялагічных, біяхімічных і інш. прыкметах. З.— найб. агульная ўласцівасць усяго жывога, рухальная сіла развіцця жывой прыроды. Прычыны ўсякай З.— уздзеянне знешніх умоў, але адрозніваюць З. няспадчынную і спадчынную. У першым выпадку прычыны — разнастайныя дзеянні вонкавага асяроддзя на фенатыпы ў працэсе іх індывідуальнага развіцця, у другім — змены спадчынных структур.

Вылучаюць З. неперарыўную — калі змены прыкмет асобін або іх груп паступовыя, і перарыўную — калі адрозненні ўзнікаюць адразу, раптам. Ч. Дарвін увёў тэрміны паўная і няпаўная З. Пры паўнай З. адрозненні ідуць у адным кірунку, пры няпаўнай — у розных кірунках. Унутры віду, пароды, сорту, папуляцыі заўсёды ёсць індывідуальная З. (унутрывідавая, унутрыпародная, унутрысартавая, унутрыпапуляцыйная). Змена паўных прыкмет у асобін віду, якія жывуць у розных месцах арэалу,— геаграфічная З. Форма З., блізкая да геаграфічнай, наз. клінавай, пры ёй прыкмета або прыкметы (напр., памеры цела жывёлы ці даўжыня крылаў) паступова большаюць або меншаюць у паўным кірунку ўнутры арэала віду. Прыкметы асобін зменьваюцца па сезонах (напр., светлая афарбоўка некат. млекакормячых і птушак зімою, больш цёмная летам — сезонная З.); па ўзростах (узроставая З.), у сувязі з спецыфічнымі экалагічнымі ўмовамі (вільготнае ці сухое асяроддзе — экалагічная З.). З., якая выяўляецца ў большай ці меншай сувязі паміж рознымі прыкметамі, наз. карэляцыйнай. Спадчынную З. падзяляюць на камбінацыйную і мутацыйную. Пры камбінацыйнай З. паяўленне новых прыкмет у патомстве — вынік перакамбінацыі генаў, якія ўжо існавалі ў бацькоў; пры мутацыйнай адбываюцца змены храмасомных набораў (паліплоідныя), асобных храмасомаў (гетэраплоідныя) або канкрэтных генаў (генныя мутацыі). Вядома мноства фіз. і хім. фактараў, здольных выклікаць мутацыйную З. Мутацыйныя змены могуць быць шкодныя, нейтральныя і спрыяльныя для віду. Менавіта апошнія — крыніца З. ў прыродных папуляцыях арганізмаў; такая З. выкарыстоўваецца ў працэсе натуральнага адбору і эвалюцыі. Спадчынная З. абодвух тыпаў служыць такса матэрыялам у селекцыі с.-г. жывёл, раслін і мікраарганізмаў. Для вывучэння З. карыстаюцца матэм.-статыстычнымі метадамі.

Літ.: Дарвин Ч. Изменения домашних животных и культурных растений, М.— Л., 1951; Дубинин Н. П. Общая генетика, М., 1970; Рокицкий П. Ф. Биологическая статистика, 2 изд., Мн., 1967; Филипченко Ю. А. Изменчивость и методы ее изучения, 4 изд., М.— Л., 1929; Яблоков А. В. Изменчивость млекопитающих, М., 1966; Майр Э. Зоологический вид и эволюция, пер. с англ., М., 1968.

П. Ф. Ракіцкі. Мінск.

ЗМЕ́СТ І ФО́РМА, філасофскія катэгорыі, якія адлюстроўваюць аб'ект у яго дэласнасці і адначасова раздвоенасці на процілеглыя бакі. Змест — сукупнасць элементаў прадмета, працэсаў, сувязей, іх узаемадзеянне між сабою і з інш. аб'ектамі. Форма — структура зместу, спосаб арг-цыі, аб'яднання элементаў аб'екта.

З. і ф. існуюць у непарыўным адзінстве. Не бывае формы без зместу, а змест заўсёды мае пэўную форму. Многія філосафы-ідэалісты адрывалі змест ад формы, метафізічна процілпастаўлялі іх адно аднаму. Адзінства З. і ф. адноснае. Змест — дынамічны бок аб'екта, форма — устойлівы, кансерватыўны бок. У рамках адносна пастаяннай формы адбываюцца колькасныя змены ў змесце, якія выклікаюць канфлікт паміж З. і ф. Старая форма скідваецца, ле ломка суправаджаецца якасным пераўтварэннем зместу, які набывае новую форму. Зместу належыць гал. роля ў развіцці аб'екта. Форма садзейнічае развіццю зместу, калі адпавядае яму, у адваротным выпадку тармозіць гэтае развіццё. Адзін і той жа змест можа быць увасоблены ў розныя формы, адна форма можа выяўляць розны змест. Новы змест часам мае старую форму, якая пристасавана да зменных умоў (напр., у сацыяліст. грамадстве існуюць старыя эканам. формы: грошы, тавар, банкі).

Літ.: Ленін У. І. Філасофскія сшыткі, Тв., т. 38 (Полн. собр. соч., т. 29); Шептулин А. П. Система категорий диалектики, М., 1967; Мамардашвили М. К. Формы и содержание мышления, М., 1968; Мамзин А. С. О форме и содержании в живой природе, Л., 1968; Широканов Д. И. Взаимосвязь категорий диалектики, Мн., 1969.

А. С. Карлюк. Мінск.

ЗМЕЯЁД, змяіны арол (Circaëtus fevox), драпежная птушка сям. ястрабіных. Пашыраны ў Еўропе, Азіі і Паўн. Афрыцы. На Беларусі трапляецца на ўсёй тэрыторыі.



Даўж. каля 70 *см*. Вочы вялікія, жоўтыя. Спіна цёмна-бурая, ніз цела стракаты. Пералётная птушка. Гняздуецца на высокіх дрэвах у старых лісцевых лясах, у забалочаных і сухадольных хваёвых барах, размешчаных паблізу балот ці забалочаных рэк. Нясе 1 яйцо. Кормяцца пераважна змеямі, яшчаркамі, жабамі. Рэдкая птушка.

Літ.: Гл. пры арт. *Драпежныя птушкі*.

ЗМЕЯНО́СЕЦ (лац. Ophiuchus), экватарыяльнае сузор'е. На тэр. БССР відаць вясной і летам. Гл. *Зорнае неба*.

ЗМРОК, аптычная з'ява ў атмасферы, паступовы пераход ад дзённага святла да начной цемры (пасля захаду Сонца) і адваротны працэс (перад узыходам). Суправаджаецца *зарою*.

Працягласць З. залежыць ад геагр. шыраты месца: чым бліжэй да экватара, тым карацейшы З.; ад схілення Сонца: у аддаленых ад экватара зонах, дзе летам Сонца апускаецца над гарызонт на невялікі вугал, вячэрні З. сутыкаецца з ранішнім і цемень зусім не настае («белыя ночы»). Канцом вячэрняга З. ўмоўна лічаць момант, калі цэнтр Сонца апускаецца над гарызонт: на 6—7° — для грамадзянскага З. (патрабуецца штучнае асвятленне); на 12° — для навігацыйнага З. (з суднаў паблізу берага не відаць берагавых арыенціраў); на 18° — для астранамічнага З. (бачны зоркі да 6-й зорнай велічыні ўключна). Адпаведна для пачатку ранішняга З. адлік адваротны.

Літ.: Розенберг Г. В. Сумеречные явления, их природа и использование для исследования атмосферы, «Успехи физических наук», 1963, т. 79, в. 3, с. 441—522.

ЗМУДЗІ́НСКІ Генадзь Яўгенавіч [17(29).1.1897, Ніжне-Удзінск Іркуцкай губ.— 22.9.1938], беларускі савецкі графік, удзельнік барацьбы за Сав. ўладу на Беларусі. З сям'і музыканта. Вучыўся ў Петраградскай АМ (1914—15). Удзельнік 1-й сусв. вайны. З 1918 у Чырв. Арміі: камандзір палка, нач. разведаддзела брыгады; удзельнік абароны Петраграда, баёў на Паўн. фронце, вызвалення Беларусі. З 1921 у Мінску, ілюстраваў школьныя падручнікі, часопісы, газеты. Асн. творы: «Пагром», «Мінская конка», «Згода нявесты», «Калікі вандроўныя» і інш. Аўтар эскіза ордэна Прац. Чырв. Сцяга БССР і граматы да яго (1924).

У. У. Грамовіч. Мінск.

ЗМЯЁЎЦЫ, вёска ў Дзятлаўскім с/с Дзятлаўскага р-на Гродзенскай вобл. Цэнтр калгаса імя Чапаева. За 3 *км* на У ад Дзятлава, 151 *км* ад Гродна, 10 *км* ад чыг. ст. Навагрудак. 137 ж., гасп. 46 (1971). Пач. школа, б-ка, магазін.

ЗМЯІНЫ АРО́Л, гл. *Змеяед*.

ЗМЯІНЫ ЯД, змесціва ядавітых слінных залоз некат. змей (гадзюка звычайная, змяякулярніца, грымучыя змеі і інш.).

Сіла атручэння З. я. залежыць ад віду змяі, месца ўкусу, колькасці яду. З. я. выклікае параліч мышцаў, парушэнне дыхання і сардэчнай дзейнасці, ацёк і амярцвенне тканак у месцы ўкусу. Лячэнне: процізмяіная сываратка і сімптаматычныя сродкі. Лекавыя прэпараты З. я. выкарыстоўваюць як болепатольны і процізапаленчы сродкі пры неўралгіях, артрытах, артрозах, міязітах.

Літ.: Машковский М. Д. Лекарственные средства, ч. 1, 6 изд., М., 1967; гл. таксама пры арт. *Змеі*.

ЗМЯЯ (лац. Serpens), экватарыяльнае сузор'е, якое складаецца з дзвюх частак — галавы і хваста, раздзеленых сузор'ем Змеяносца (гл. *Зорнае неба*). На тэр. БССР відаць вясной і летам.

ЗНАЁМЫ (сапр. Клопаў) Сяргей Змітравіч [14(27).6.1909, в. Звоня Лепельскага пав. Віцебскай губ.— 1937], беларускі савецкі пісьменнік. З сялян. Скончыў Мінскі пед. ін-т (1933). Працаваў рабочым на запалкавай ф-цы ў Барысаве, рэдактарам шматтыражкі

«Чырвоны Бярэзінец». Вучыўся ў аспірантуры і адначасова працаваў у рэдакцыі газ. «Рабочий». З 1936 рэдактар Бел. радыё. Друкавацца пачаў у канцы 20-х гадоў. Аўтар зб. надарожных нататкаў «Відагоршчы» (1930), кніг нарысаў «Дом № 31» (1930), «За дамбаю» (1931), «Лес гарыць» (1932), аповесцей «Ганчары» (1933) і «Біяграфія майго героя» (1935). Запісваў і даследаваў бел. фальклор (арт. «Рабочая песня», 1935).

Літ.: Чорны К. Заўвагі да стылёвых тэндэнцый у творчасці С. Знаёмага, «Полымя рэвалюцыі», 1935, № 5.

ЗНАК, матэрыяльны прадмет любой прыроды (рэч, з'ява, падзея, дзеянне і інш.), які ўспрымаецца пачуццёва і замяшчае сабою ў пазнанні (абазначае) і ў зносінах людзей пэўны аб'ект, што адлюстроўваецца, уключаючы абстрактныя (ідэальныя) аб'екты. Пры дапамозе ўласцівасці выказваць або абазначаць думку З. ажыццяўляюць гнасеалагічную функцыю, а тым, што служаць сродкам зносін,— камунікатыўную функцыю.

У пазнанні і зносінах людзі карыстаюцца рознымі З., якія аб'ядноўваюцца ў *знакавыя сістэмы*. Для непасрэднага выражэння вынікаў мыслення выкарыстоўваюцца натуральныя і штучныя моўныя знакавыя сістэмы. З. такіх сістэм могуць мець не толькі значэнне, але і сэнс (гл. *Значэнне і сэнс*). Асн. прызначэнне З. і знакавых сістэм у пазнанні і зносінах людзей — фіксаванне, захоўванне, перапрацоўка і перадача інфармацыі. Адносіны «прадмет — знак — чалавек» ствараюць знакавую сітуацыю. Агульную тэорыю З. распрацоўвае *семіётыка*.

Літ.: Пузиков П. Д. Знаки понятийного и «символического» мышления, «Научные доклады высшей школы. Философские науки», 1967, № 1; Уваров Л. В. Образ, символ, знак, Мн., 1967; Черч А. Введение в математическую логику, т. 1, пер. с англ., М., 1960. *П. Дз. Пузікаў*. Мінск.

ЗНАК (Мураўёў) Пётр Ігнатавіч (снеж. 1905, в. Нежаўка Ігуменскага пав. Мінскай губ.— 4.7.1942), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыз. руху ў Мінскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. З 1926 у чыг. дэпо Мінска, на сав. рабоце ў Чэрвені, Слоніме, Зэльве. У жн. 1941 паводле рашэння Мінскага падпольнага к-та КП(б)Б арганізаваў адзін з першых партыз. атрадаў, быў яго камандзірам. З 28.5.1942 камісар атрада Нікіціна. Кіраўнік *Александроўскага бою*. Загінуў у баі.

ЗНАК ЯКАСЦІ, гл. *Дзяржаўны знак якасці*.

ЗНАКАВАЯ СІСТЭМА, мноства элементаўзнакаў, упарадкаваных і ўзаемазвязаных паводле пэўных законаў або прынцыпаў. Выкарыстоўваюцца як сродак пазнання навакольнага свету. Узнікненне З. с. абумоўлена існаваннем у самой рэчаіснасці сувязей паміж прадметамі і з'явамі, дзякуючы чаму З. с. становяцца адлюстраваннем аб'ектыўных сувязей, працэсаў рэальнага свету.


Як і знакі, існуюць натуральныя і штучныя З. с. Прыклад натуральных — гутарковыя (нацыянальныя) мовы. Іх знакі — словы, якім уласціва шматзначнасць (полісемія) і звязанае з ёй некат. недакладнасць інфармацыі, якая вафіксавана або перадаецца. Разнавіднасці З. с.— флажковая сігналізацыя, што ўжываецца ў флоце для перадачы паведамленняў, мова жэстаў глуханямых і інш. У З. с. такога роду словы заменены пэўнымі камбінацыямі жэстаў або флажкоў. Пэўната і агульнасць звестак, што перадаюцца імі, значна бядней шыя за тыя, якія могуць быць выражаны з дапамогай натуральнай мовы. Прыклад штучных З. с.— штучныя фармальныя мовы. Яны выкліканы да жыцця ў сувязі з развіццём навукі і неабходнасцю пераадолення недахопаў натуральных моў. Зместнай навукі будуецца з дапамогай як натуральнай мовы, так і спецыфічнай для адпаведнай навукі штучнай мовы. Больш высокі ўзровень развіцця навукі суправаджаецца павелічэннем долі пэўнай мяжы ўдзельнай вагі штучных З. с.— формул, вылічэнняў. Апошнія будуюцца на базе натуральнай мовы, неабходнай для апісання знакаў штучнай мовы і правілаў аперыравання з імі. Найб. характэрны прынцып стварэння штучных З. с. навукі — іх аксіяматычная пабудова. Стварэнне сістэмы пачынаецца з дакладнага пераліку ледзь знакаў, якія дзеляцца на дзве групы: 1) пастаянныя і пераменныя; 2) асаблівыя знакі (сімвалы), неабходныя для ўсталявання, фіксавання, вызначэння сувязей і адносін паміж пастаяннымі і пераменнымі. Першая група знакаў можа мець самастойны зместу другая пазбаўлена яго. Аднак менавіта знакам другой групы належыць гал. роля ў стварэнні сістэм знакаў, паколькі дзякуючы ім пераменныя і пастаянныя атрымліваюць новую якасць — элементаў-формул; змест такіх знакаў (калі ён існуе) ёсць адлюстраванне сувязей паміж аб'ектамі рэальнага свету. Пры стварэнні штучных З. с. указваецца шэраг камбінацый знакаў (формул, аксіём), якія ў адпаведнай сістэме з'яўляюцца асэнсаванымі або правільнымі. Нарэшце, дакладна фармулююцца правілы аперыравання, з дапамогай якіх з пэўных выразаў мовы, якая ствараецца, можна выводзіць іншыя. Стварэнне такіх штучных З. с.— выходны момант пазнавальнага працэсу, патрабуе звароту да рэальных аб'ектаў, у выніку чаго З. с. набываюць змест. Штучныя З. с. маюць неабходныя для пазнавальнага працэсу якасці:

Знакі папераджальныя: 1. 1. Чыгуначны пераезд без шлагбаўма. 1. 2. Чыгуначны пераезд з шлагбаўмам. 1. 3. Скрыжаванне. 1. 4. Перакрыжаванне з другараднай дарогай. 1. 5. Перакрыжаванне з галоўнай вуліцай ці дарогай. 1. 6. Скрыжаванне з рэгуляваннем. 1. 7 а. Паварот направа. 1. 7 б. Паварот налева. 1. 8. Звілістая дарога. 1. 9. Круты спуск. 1. 10. Няроўная дарога. 1. 11. Слізкая дарога. 1. 12. Звужэнне дарогі. 1. 13. Развадны мост. 1. 14. Двухбаковы рух. 1. 15. Пешаходы. 1. 16. Дзеці. 1. 17. Рамонтныя работы. 1. 18 (а, б). Жывёла на дарозе. 1. 19. Іншая небяспека.

Знакі забараняльныя: 2. 1. Уезд забаронены. 2. 2. Рух забаронены. 2. 3. Аўтамабільны рух забаронены. 2. 4. Грузавы рух забаронены. 2. 5. Матацыклетны рух забаронены. 2. 6. Гужавы рух забаронены. 2. 7. Рух трактараў забаронены. 2. 8. Веласіпедны рух забаронены. 2. 9. Абмежаванне вагі. 2. 10. Абмежаванне нагрузкі на вось. 2. 11. Абмежаванне габарытнай вышыні. 2. 12. Абмежаванне габарытнай шырыні. 2. 13. Праезд без прыпынку забаронены. 2. 14 а. Паварот налева забаронены. 2. 14 б. Паварот направа забаронены. 2. 15. Паварот назад забаронены. 2. 16. Абгон забаронены. 2. 17. Абгон грузавым аўтамабілям забаронены. 2. 18. Абмежаванне скорасці. 2. 19. Падача гукавога сігналу забаронена. 2. 20. Прыпынак забаронены. 2. 21. Стаянка забаронена. 2. 22. Канец абмежаванняў.

Знакі прадпісальныя: 3. 1 (а, б, в, г, д). Дазволены кірунак руху. 3. 2 (а, б). Кірунак аб'езду перашкоды. 3. 3. Кругавы рух. 3. 4. Рух легкавых аўтамабіляў дазволены. 3. 5. Рух грузавых аўтамабіляў дазволены. 3. 6. Матацыклетны рух дазволены. 3. 7. Веласіпедны рух дазволены.


Папераджальныя знакі.



Забараняльныя знакі.



Прадпісальныя знакі.



Паказальныя знакі.


4.1


4.2


4.3


4.4


4.5


4.6


4.7



4.8


4.9


4.10

Дадатковыя таблічкі да знакаў.



5.1



5.2а



5.2б



5.3


Паказальнік «Сцеражыся цягніка».



5.4


5.5


5.6а 5.6б 5.6в


а б

Дарожныя паказальнікі.



6.1



6.2



6.3



6.4



6.5



6.6

Знакі дарожныя II.

дакладнасць, агляднасць, шматзначнасць інтэрпрэтацый.

Літ.: Попович М. В. О философском анализе языка науки, Киев, 1966; Резников Л. О. Гносеологические вопросы семиотики, Л., 1964; Семиотика и восточные языки, М., 1967; Ракитов А. И. Анатомия научного знания, М., 1969.

Г. П. Лапатніна. Мінск.

ЗНАКІ АДРОЗНЕННЯ ваенныя, прыналежнасць формы адзення ваеннаслужачых: пагоны, пятліцы, зоркі, эмблемы, нагрудныя і нарукаўныя знакі, акантоўка, лампасы і інш., якія абазначаюць род войск, службу і *званні воінскія*. Для Узбр. Сіл СССР устанаўлівае Прэзідыум Вярх. Савета і Савет Міністраў СССР.

Асн. З. а. ва Узбр. Сілах СССР — наплечныя пагоны: штодзённыя (паляўнічыя) і парадныя. Уведзены ў 1943. Штодзённыя (палявыя) — ахоўнага колеру, у афіцэраў — прасветы, генералаў — канты. Парадныя пагоны маюць поле з пазалочанага ці пасярэбранага галуноў і ў залежнасці ад віду Узбр. сіл, роду войск і службаў — розны колер прасветаў і кантаў, розную колькасць прасветаў (на афіцэрскіх пагонах), нашывак і пэўнага памеру зорак для адпаведных ваен. званняў; у радавых і сяржантаў літары СА. Пятліцы пэўнага колеру носяць: на каўнярах мундзіраў — з кантам залацістага колеру, на каўнярах кіцеляў і шынялёў — без канта. Нарукаўныя знакі — галуны залацістага колеру — носяць адмі-ралы і афіцэры карабельнага саставу ВМФ СССР. Ваеннаслужачыя вышэйшай тэрміновай службы, салдаты і сяржанты тэрміновай службы, курсанты ваенных і ваенна-марскіх вучылішчаў, суворацы і нахімавцы маюць нарукаўныя знакі па родах войск, нашыўкі па гадах навучання, па гадах вышэйшай тэрміновай службы, а ў ВМФ СССР — нарукаўныя знакі па спецыяльнасцях. Нагрудныя знакі паказваюць ваенную адукацыю, класную кваліфікацыю і інш.

ЗНАКІ АСТРАНАМІЧНЫЯ, умоўныя абазначэнні Сонца, Месяца, планет, іх канфігурацый, фазаў Месяца і да т. п., якімі карыстаюцца ў астранамічнай літаратуры і ў календарах (гл. табл.). Некаторыя З. а. служаць для абазначэння месяцаў і дзён тыдня.

ЗНАКІ ДАРОЖНЫЯ, сімвалічныя знакі на шчытках вызначанай формы, памераў і афарбоўкі, якія ставяцца на аўтамаб. дарогах, на вуліцах гарадоў і інш. нас. пунктаў, каб папярэдзіць вадзіцеляў пра небяспечныя ўчасткі і даць інфармацыю пра абмежаванні ці інш. асаблівасці ўмоў руху.

З. д.— найб. стары сродак рэгуліроўкі руху. Першыя З. д. з'явіліся ў перыяд росквіту Кіеўскай дзяржавы. У гэты час робяцца спробы вызначыць працягласць дарог. У 1805 у Расіі ўпершыню зацверджаны З. д. У СССР прынята еўрапейская сістэма знакаў і дарожных паказальнікаў, пры якой на шчыткі наносяцца сімвалічныя адлюстраванні. З. д. адпавядаюць патрабаванням Міжнар. канвенцый аб дарожным руху. На вуліцах гарадоў, інш. нас. пунктаў і на дарогах СССР устаноўлены З. д., якія падзяляюцца на 4 групы (гл. ўкл.): папераджальныя, забараняльныя, прадпісальныя і ўказальныя. Папераджальныя маюць форму роўнастаронняга трохвугольніка, забараняльныя і прадпісальныя — форму круга, ўказальныя — квадрата ці прамавугольніка. Знакі 1-й групы пафарбаваны: поле жоўтае, кайма чырвоная, сімволіка чорная. Знакі 2-й групы маюць такую ж афарбоўку, за выключэннем знакаў 2.20 (блакітнае поле) і 2.22 (няма каймы). Знакі 3-й групы: поле блакітнае, сімволіка белая. Знакі 4-й групы: блакітныя шчыткі з белай, чорнай ці чырвонай сімволікай (выключэнне: знакі 4.9 і 4.10 маюць жоўтае і белае поле). Каб уласціць дзеянне знакаў, робяцца дадатковыя таблічкі. Вадзіцелям транспартных сродкаў памагаюць арыентавацца блакітныя дарожныя паказальнікі з белымі надпісамі і стрэлкамі. З. д. і паказальнікі ставяцца адлюстраваннем толькі насустрач руху, на спец. калонках на тратуарах ці на абочынах дарог, падвешваюцца на тросах над праезнай

Знакі паказальныя: 4. 1. Месца стаянкі. 4. 2. Месца павароту назад. 4. 3. Лагер аўтатурыстаў. 4. 4. Пункт харчавання. 4. 5. Пункт медыцынскай дапамогі. 4. 6. Пункт тэхнічнага абслугоўвання. 4. 7. Тэлефон. 4. 8. Аўтазаправачная станцыя. 4. 9. Галоўная вуліца ці дарога. 4. 10. Канец галоўнай вуліцы ці дарогі.

Дадатковыя таблічкі: 5. 1. Зона дзеяння знака. 5. 2 (а, б). Адлегласць да аб'екта. 5. 3. Час дзеяння знака. 5. 4. Кірунак аб'езду. 5. 5. Від транспартных сродкаў. 5. 6 (а, б, в). Небяспечны чыгуначны пераезд.

Дарожныя паказальнікі: 6. 1. Паказальнік назвы населеных пунктаў. 6. 2. Паказальнік кірунку. 6. 3. Паказальнік адлегласці. 6.4. Папярэдні паказальнік кірунку. 6. 5. Маршрутная марка. 6. 6. Кіламетровы паказальнік.

Знакі астранамічныя

Знакі сяцілаў і дзён тыдня

☉	— Сонца (нядзеля)	♅ ці ♁	— Уран
☾	— Месяц (панядзелак)	♆ ці ♇	— Нептун
♂	— Марс (аўторак)	♇	— Плутон
☿	— Меркурый (серада)	⊕ ці ♁	— Зямля
♃	— Юпітэр (чацвер)	☄	— камета
♀	— Венера (пятніца)	*	— зорка
♄	— Сатурн (субота)		

Знакі задыяка і месяцаў

♒ ці ♒	— Вадалей (студзень)	♌ ці ♌	— Леў (ліпень)
♓ ці ♓	— Рыбы (люты)	♍ ці ♍	— Дзева (жнівень)
♈ ці ♈	— Авен (сакавік), пункт вясенняга раўнадзенства	♎ ці ♎	— Шалі (верасень), пункт асеняга раўнадзенства
♉ ці ♉	— Цялец (красавік)	♏ ці ♏	— Скарпіён (кастрычнік)
♊ ці ♊	— Блізняты (май)	♐ ці ♐	— Стралец (лістапад)
♋ ці ♋	— Рак (чэрвень)	♑ ці ♑	— Казярог (снежань)

Знакі фазаў Месяца

● ці ●	— маладзік	○ ці ○	— поўня
☽ ці ☽	— першая квадра	☾ ці ☾	— апошняя квадра

Знакі аспектаў (узаемнага размяшчэння сяцілаў)

☌	— злучэнне	△	— трыганальны аспект (розніца даўгот 120°)
☍	— процістаянне		
□	— квадратура, чацвярны аспект (розніца даўгот 90°)	⚹	— секстыльны аспект (розніца даўгот 60°)
☊ ці ☊	— узыходны вузел; даўгата яго ў арбіце	☋ ці ☋	— сыходны вузел; даўгата яго ў арбіце

частка справа па кірунку руху. У нац. рэспубліках і на турысцкіх маршрутах як дадатак да паказальніка з надпісам на рус. мове пры неабходнасці можа быць пастаўлены паказальнік з надпісам адпаведна на нац. мове ці з надпісам на рус. мове (лац. шрыфтам). З 1.7.1972 у СССР уводзіцца новы дзярж. стандарт на З. д.

Літ.: Клинковштейн Г. И., Соловьев Г. М. и Юмашев Н. И. Пособие по правилам движения автомобилей, 3 изд., М., 1970.

А. В. Зубовіч. Мінск.

ЗНАКІ ЛОГІКІ, сістэмы знакаў (сімвалаў), якія выкарыстоўваюцца ў традыцыйнай і *матэматычнай логіцы* для абазначэння, напр., відаў суджэнняў, модусаў сілагізмаў, пастаянных і пераменных лагічных канстантаў, а таксама лагічных аперацый (гл. *Вылічэнне выказванняў, Вылічэнне класаў, Вылічэнне прэдыкатаў*, а таксама *Алгебра логікі*).

Знакі, якімі карыстаюцца ў матэматычнай логіцы (галоўныя)

Назва аперацыі	Знакі	Прыклад ужывання
Кан'юнкцыя	&, ∧, ·	$A \& B$
Дыз'юнкцыя (невыключальная)	∨	$A \vee B$
Дыз'юнкцыя (выключальная)	∨∨, ⩒, :	$A \vee \vee B$
Імплікацыя	→, ⊃, —<	$A \to B$
Адмаўленне	—, ¬, ~	$\overline{A}$, $\neg A$, $\sim A$
Эквівалентнасць	~, ≡	$A \sim B$
Раўназначнасць (тоеснасць)	=, ↔, ⇄, ≈	$A = B$
Перасячэнне класаў (мностваў)	∩	$A \cap B$
Складанне класаў (мностваў)	∪	$A \cup B$
Уключэнне класаў (мностваў)	⊂	$A \subset B$
Уключэнне элемента ў клас	∈	$A \in B$
Выводнасць	⊢	$A_1 \dots A_2 \vdash B$
Квантар агульнасці	∀	$\forall x\, P(x)$
Квантар існавання	∃	$\exists x\, P(x)$
Мадальны аператар неабходнасці	□	$\Box P$
Мадальны аператар магчымасці	◇	$\Diamond P$

Літ.: Кондаков Н. И. Логический словарь, М., 1971, с. 467—472.

ЗНАКІ МАТЭМАТЫЧНЫЯ, сістэмы знакаў (сімвалаў), якімі карыстаюцца пры матэм. вылічэннях. Гл. табл. асн. матэм. знакаў.

Узнікненне матэм. сімволікі цесна звязана з агульным развіццём паняццяў і метадаў матэматыкі. Першымі З. м. былі лічбы. У працах старажытнагрэч. вучонага Дыяфанта сустракаюцца пачаткі літарных абазначэнняў. Сучасная алгебраічная сімволіка ўзнікла ў 15—17 ст. Развіццё і ўдасканаленне матэм. сімволікі спрыяла ўзнікненню новых раздзелаў матэматыкі (гл., напр., *Аперацыйнае вылічэнне, Варыяцыйнае вылічэнне, Тэнзарнае вылічэнне*) і матэм. логікі (гл. *Алгебра логікі, Знакі логікі*).

Літ.: Юшкевич А. П. История математики в средние века, М., 1961; Бурбаки Н. Очерки по истории математики, пер. с франц., М., 1963 (Элементы математики).

А. А. Гусак. Мінск.

ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ (пунктуацыя), графічныя сродкі перадачы граматычнай і інтанацыйнай будовы сказа. Узніклі з пачаткам кнігадрукавання (15 ст.). Сучасная бел. мова мае 10 З. п.: кропка, пытальнік, клічнік (паказваюць канец сказа і адпавядальную, пытальную і клічную інтанацыю); коска, кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік, дужкі (ставяцца ўнутры сказа); двукоссе (выдзяляе простую мову і цытаты); шматкроп'е (паказвае запінку, пропуск, незакончанасць).

Працяжнік адметны шматзначнасцю. Раздзяляльныя (кропка, коска, двукроп'е і інш.) — адзіночныя; выдзяляльныя (дужкі, двукоссе, коскі, працяжнікі) — заўсёды парныя. Некат. падвойваюцца, патройваюцца і спалучаюцца памiж сабою. Найчасцей пунктуацыя абумоўлена толькі сінтакс. будовай сказа, безадносна да канкрэтнай інтанацыі, і мае строгую нарматыўнасць. Інтанацыйныя З. п. арыентуюцца на вымаўленне і бываюць факультатыўныя (асабліва коска і працяжнік у мастацкай мове). У абодвух выпадках З. п. цесна звязаны з сэнсава-грамат. і эмацыянальна-стыліст. зместам сказа. Сказы без З. п. былі б двухсэнсавыя ці цьмяныя, напр.: «Скажы яму добра» — «Скажы яму: добра!» — «Скажы: яму добра?» — «Скажы яму. Добра?».

Асноўныя матэматычныя знакі

	Знак	Значэнне	Кім і калі ўведзены
Знакі індывідуальных аперацый, адносін, аб'ектаў	$+$	складанне	Канец 15 ст.
	$-$	адніманне	
	$\times$	множанне	У. Оўтрэд, 1631,
	$\cdot$		Г. Лейбніц, 1698
	$:$	дзяленне	Г. Лейбніц, 1684
	a^n	ступень	Р. Дэкарт, 1637
	$\sqrt{}$	корань	А. Жырар, 1629
	log	лагарыфм	В. Кавальеры, 1632
	sin, cos	сінус, косінус	Л. Эйлер, 1748
	tg	тангенс	Л. Эйлер, 1753
	dx, d^2x ...	дыферэнцыял	Г. Лейбніц, 1675
	$\int y\,dx$	інтэграл	
	lim	граніца	У. Гамільтан, 1853
	$=$	роўнасць	Р. Рэкард, 1557
	$> <$	больш, менш	Т. Гарыят, 1631
	$\parallel$	паралельнасць	У. Оўтрэд, 1677
	∞	бясконечнасць	Дж. Валіс, 1655
	e	аснова натуральных лагарыфмаў	Л. Эйлер, 1736
	π	адносіны даўжыні акружнасці да ля дыметра	
	i	уяўнал адзінка $\sqrt{-1}$	Л. Эйлер, 1777
	$\vec{i}$, $\vec{j}$, $\vec{k}$	адзінкавыя ўзаемна перпендыкулярныя вектары	У. Гамільтан, 1853
Знакі перамен. аперацый і аб'ектаў	$f(x)$	функцыя	Л. Эйлер, 1734
	x, y, z	невядомыя ці зменныя велічыні	Р. Дэкарт, 1637
	a, b, c	адвольныя пастаянныя	
	$\vec{r}$	вектар	А. Кашы, 1853

Літ.: Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, Мн., 1959; Клюсаў Г. Н. і Юрэвіч А. Л. Сучасная беларуская пунктуацыя, Мн., 1966.

ЗНАКІ ХІМІЧНЫЯ, гл. ў арт. *Элементы хімічныя.*

ЗНАМЕНКА, вёска ў Мядноўскім с/с Брэсцкага р-на. Цэнтр саўгаса «Сцяг». За 30 *км* на Пд ад Брэста, 8 *км* ад чыг. ст. Дурычы, на шашы Брэст — в. Тамашоўка. 1037 ж., гасп. 307 (1971). Сярэдняя школа, клуб, б-ка, дзіцячыя яслі, фельч.-ак. пункт, адда. сувязі, магазін. Брацкая магіла 36 сав. воінаў і партызан, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗНАМЕНКА (да 1958 Слянцы), вёска ў Азяранскім с/с Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл., паміж р. Сцвіга (1 *км*) і Прыпяць (2 *км*). Цэнтр калгаса «Савецкая Беларусь». За 27 *км* на Пд ад Жыткавіч, 265 *км* ад Гомеля. 570 ж., гасп. 153 (1971). Млын, мех. майстэрні. Пач. школа, клуб, б-ка, 2 магазіны.

ЗНАМЕНКА (да 1969 Падонкі), вёска ў Лагойскім р-не Мінскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна. За 10 *км* на ПдУ ад Лагойска, 43 *км* ад Мінска, 28 *км* ад чыг. ст. Смалявічы, на аўтамаб. дарозе г. Жодзіна — в. Дзяніскі. 343 ж., двароў 119 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, бальніца, аптэка, адда. сувязі, магазін. У 1943 вёску часткова спалілі ням.-фаш. захопнікі, загубілі 29 мірных жыхароў.

ЗНАМЕННЫ РАСПЕЎ, асноўны збор праваслаўных царкоўных напеваў, якія былі пашыраны ў Расіі, на Украіне і на Беларусі.

Назва паходзіць ад стараж.-слав. слова «знамя» — знак, і ўпачатку азначала зафіксаваныя напевы, у адрозненне ад спеваў па вуснай традыцыі. Узнік у 12 ст. на аснове напевак, запазычаных з нар. песеннасці і падпарадкаваных пэўнай сістэме з 8 ладоў («осьмагласіе»). Апагей развіцця З. р. прыпадае на 16 ст., калі ён уключаў найбольш напевак і калі мелодыі з псалмадыйных перараслі ў шырокараспеўныя, складаныя па вышынным контуры і рытме. У 17 ст. намецілася тэндэнцыя да спрашчэння напеваў, каб лепш адчуваўся лад і не зацямняліся тэксты, была створана скарочаная рэдакцыя З. р., т. зв. малы З. р. (поўны З. р. наз. вялікім). Мелодыі З. р. апрацоўвалі А. Львоў, П. Чайкоўскі, С. Рахманінаў, А. Кастальскі, А. Архангельскі, А. Кошыц і інш.

Літ.: Бражников М. В. Пути развития и задачи расшифровки знаменного распева XII—XVIII веков, Л.—М., 1949; Успенский Н. Древнерусское певческое искусство, М., 1965; Его же. Образцы древнерусского певческого искусства, Л., 1968.

М. Дз. Успенскі. Ленінград.

ЗНАМЯ (да 1964 Старцавічы), вёска ў Слуцкім р-не Мінскай вобл., каля р. Лакнея (2,5 *км*). Цэнтр Сярэднікаўскага с/с і калгаса «Прамень камуны». За 14 *км* на З ад Слуцка, 119 *км* ад Мінска, 1 *км* ад чыг. ст. Сярэднікі. 784 ж., двароў 224 (1971). Лесапільня, млын, швейная майстэрня. Сярэдняя школа, клуб, б-ка, бальніца, вет. пункт, адда. сувязі, магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў грамадз. і Айч. войны.

«ЗНАМЯ ЮНОСТИ», камсамольска-маладзёжная газета, орган ЦК ЛКСМ Беларусі. Выдаецца ў Мінску з 10.4.1938; да чэрв. 1956 (№ 120) наз. «Сталинская молодежь» (у час Вял. Айч. вайны не выдавалася). Выходзіць 5 разоў на тыдзень на рус. мове. Друкуе матэрыялы аб прац. жыцці, вучобе, адпачынку моладзі, асвятляе работу камсамольскіх арг-цый, праблемы міжнар. маладзёжнага дэмакр. руху, пытанні ваенна-патрыят. выхавання, змяшчае міжнар., спарт. і інш. інфармацыю. Пры газеце працуюць школа юнкораў, літ. аб'яднанне «Вясёлка», клубы «Паверка», «Рэпарцёр». Друкуе мэтавыя старонкі: «Калегі», «Равеснік», «Веча сяброў прыгожага», «Вербачка» і інш. Рэдактар В. Дз. Чанін (з ліп. 1963).

В. Дз. Чанін. Мінск.

ЗНАХАРСТВА, спроба лячыць хворых з выкарыстаннем сродкаў і спосабаў, не абгрунтаваных медыцынскай навукай. Паколькі знахары не ведаюць прычын і сутнасці хваробы, іх дзеянні разлічаны на невуцтва легкаверных і прымхлівых людзей. У капіталіст. і калан. краінах З.— спосаб лёгкай нажывы. З. можа прынесці вял. шкоду хвораму, бо траціцца час, неабходны для медыкаментознага або хірург. лячэння. У СССР З. караецца як крымінальнае злачынства.

Літ.: Бородулин Ф. Р. История медицины. Избр. лекции, М., 1961; История медицины СССР, М., 1964; Народная медицина, у кн.: Здравоохранение Белорусской ССР за сорок лет (1919—1958). Указатель лит., Мн., 1961.

І. А. Франкоў. Віцебск.

ЗНАХОДКА, рэч, згубленая ўладальнікам і знойдзеная інш. асобай.

Асоба, што знайшла рэч, павінна вярнуць яе ўладальніку або, калі ён невядомы, здаць у міліцыю ці ў сельскі Савет дэпутатаў працоўных. З. зберагаецца 6 месяцаў, пасля чаго становіцца ўласнасцю дзяржавы. Асоба, якая знайшла рэч, узнагароды не атрымлівае, але ёй кампенсуюць (уладальнік ці дзяржава) выдаткі, якія яна мела ў сувязі з зберажэннем і перадачай З.

ЗНАЧЭННЕ І СЭНС, найважнейшыя паняцці тэорыі знакаў і знакавых сістэм. Пад значэннем звычайна разумеюць той прадмет (фрагмент рэчаіснасці, аб'ект або клас аб'ектаў), які абазначаецца пэўным знакам, а пад сэнсам — думку, якую ён перадае, паняцце, што фіксуе сукупнасць уласцівасцей (адзнак), якімі характарызуецца абазначаны прадмет і па якім ён вылучаецца з мноства інш. прадметаў. Дзякуючы сэнсу знак набывае адносіны да прадмета і мае пэўнае значэнне. Вызначэнне сэнсу знака — адзін са спосабаў выяўлення значэння (побач з указаннем на прадметы, якія ўспрымаюцца, апісаннем прадметаў сукупнасцю слоў, перадачай малюнкамі, жэстамі, шляхам аналізу кантэксту і інш.). Знакі, тоесныя па сэнсе,— тоесныя па значэнні, але не заўсёды наадварот. Напр., выразы «роўнастаронні прамавугольнік» і «чатырохвугольнік з роўнымі вугламі і роўнымі дыяганалямі» маюць адно і тое значэнне (імі абазначаны адзін і той прадмет — квадрат), але розны сэнс (у іх разумеюцца розныя ўласцівасці квадрата). Ва ўжытку і навуцы пра мову паняцці З. і с. часта атаясамліваюцца.

Літ.: Зиновьев А. А. Логика науки, М., 1971, с. 33—44; Проблема знака и значения, М., 1969; Пузиков П. Д. Аналитическая способность мышления, Мн., 1965.

У. Ф. Бяркоў. Мінск.

ЗНЕШНЕГАНДЛЕВЫ БАНК СССР (Банк для знешняга гандлю), савецкая акцыянерная крэдытная ўстанова, якая абслугоўвае плацежны абарот СССР з замежнымі

краінамі. Дзейнічае з сак. 1924 на базе Расійскага камерцыйнага банка. Акцыянеры: Дзяржбанк СССР, Мін-ва фінансаў СССР, Мін-ва знешняга гандлю СССР, Дзяржкамітэт Савета Міністраў СССР па знешніх эканам. сувязях, Будбанк СССР, Цэнтрасаюз і інш. спецыялізаваныя экспартна-імпартныя арг-цыі. З. б. садзейнічае развіццю гандл. і інш. эканам. сувязей СССР з замежнымі краінамі, развіццю ўнутранага гандлю і прамысловасці, звязаных з экспартам і імпартам.

Асн. функцыі: вядзенне асабовых рахункаў замежных прадстаўніцтваў; разліковыя і крэдытныя аперацыі па экспарце і імпарце тавараў, па крэдытах і пазыках; клірынгавыя рахункі замежных банкаў па тавараабароце і негандл. аперацыях; грашовыя пераводы за мяжу і з-за мяжы; куплю і продаж замежнай валюты, плацежных дакументаў, выпісаных у замежнай валюце, каштоўных металаў і фондавых каштоўнасцей; абмен валюты для турыстаў і асоб, якія выязджаюць за мяжу ці прыязджаюць у СССР. У неабходных выпадках робіць перавод адной замежнай валюты ў другую (канверсійныя аперацыі). На пач. 1970 банк меў больш чым 1300 банкаў-карэспандэнтаў у 104 краінах. Акц. і рэзервовы капітал яго складаў 408 млн. руб., баланс 7258 млн. руб., выдадзеныя крэдыты 5360 млн. руб., сума на бягучыя і інш. рахункі 5416 млн. руб., чысты прыбытак (пасля плацяжоў у дзяржбюджэт) за 1969 — 37,4 млн. руб. Вышэйшы орган кіравання — агульны сход акцыянераў, які раз у 3 гады выбірае савет, праўленне і рэвіз. камісію. Установы банка ў Маскве, філіял — у Ленінградзе (паводле статута філіялы могуць быць і за мяжой).

Літ.: Кредитно-денежная система СССР, М., 1967; Денежное обращение и кредит СССР, М., 1970; Финансы и кредит СССР, М., 1964.

В. Ф. Сонцаў. Мінск.

ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ, абмен таварамі і паслугамі паміж краінамі шляхам куплі-продажу. Уключае ўвоз (імпарт) і вываз (экспарт) тавараў. У сацыяліст. краінах ажыццяўляецца на аснове *манаполіі знешняга гандлю* ў інтарэсах больш хуткага развіцця прадукцыйных сіл, рацыянальнага падзелу працы і паляпшэння дабрабыту працоўных на прынцыпах узаемнай выгады, роўнасці бакоў, неўмяшання ва ўнутр. справы дзяржаў. Важнае значэнне для развіцця гандл. сувязей сацыяліст. краін мае *Савет Эканамічнай Узаемадапамогі* (СЭУ).

У 1969 абарот З. г. краін СЭУ склаў каля 48,7 млрд. руб., у т. л. абарот іх узаемнага гандлю каля 30 млрд. руб. (у 3,5 раза больш, чым у 1965). Сав. экспарт за 1959—69 павялічыўся больш як удвая (гл. табл.). У ім (1969) пастаўкі машын і абсталявання займалі 22,5%, руды, металу і вырабаў з іх 19,4, паліва і электраэнергіі 15,7, харч. тавараў і сыравіны для іх вытворчасці 10,7, лесаматэрыялаў і цэлюлозна-папяровых вырабаў 6,2%. Прывозяцца ў СССР пераважна машыны і абсталяванне (больш як ⅓ ад усяго імпарту), прамысл. сыравіна, тавары нар. ўжытку. Амаль ⅓ З. г. СССР прыпадае на сацыяліст. краіны. Развіваецца З. г. СССР з краінамі, якія сталі на шлях незалежнага развіцця: у 1969 тавараабарот склаў 2512 млн. руб., у т. л. экспарт 1520 млн., імпарт 992 млн. руб. Вырас З. г. і з развітымі капіталіст. краінамі. У 1969 гандл. абарот з гэтымі краінамі ў параўнанні з 1959 павялічыўся амаль у 3 разы (каля 22% знешнегандл. абароту СССР).

З дарэвалюц. Беларусі на экспарт пераважна ішлі прадукты с. гасп., з іх агульнага аб'ёму 49,7% прыпадала на лён і пенькавалакно, 14,5 на бульбу і прадукты з яе, 10 на садавіну, 14,8% на алей. Беларусь давала 27,4% агульнарасійскага экспарту лесу. З-за мяжы прывозілі прамысл. вырабы, машыны, абсталяванне і некат. віды сыравіны.

Індустрыялізацыя БССР карэнным чынам змяніла характар бел. экспарту. У 1969 тавары, выпрацаваныя ў БССР, пастаўляліся ў 82 краіны, у т. л. ў 12 сацыялістычных, у 52 краіны, якія сталі на шлях незалежнага развіцця, і ў 18 капіталістычных. Асн. экспартныя тавары: трактары, грузавыя аўтамабілі і аўтамаб. прычэпы, металарэзныя станкі, падшыпнікі, вылічальныя, с.-г. і дарожнабуд. машыны, электра- і радыётэхн. прылады, радыёпрыёмнікі, матацыклы, веласіпеды, гадзіннікі. Удзельная вага машын і абсталявання ў структуры экспартных тавараў рэспублікі большая, чым у экспарце ЗША, Вялікабрытаніі, ФРГ, Італіі, а таксама ва ўсім сусв. тавараабароце. Адначасова меншае ўдзельная вага сыравінных і харч. тавараў, прычым у 2-й пал. 60-х г. іх наменклатура істотна змянілася. Побач з ільновалакном рэспубліка пастаўляе за мяжу льняныя тканіны і гатовыя вырабы з іх, з драўніны — мэблю, дзіцячыя цацкі і г. д. Развіццё хім., нафтахім. і нафтаперапр. прамысловасці дало магчымасць экспартаваць нафту і нафтапрадукты, калійныя ўгнаенні, серную к-ту, поліэтылен і інш. тавары. Прадукцыю па экспарт вырабляюць больш як 300 прадпр. і арг-цый рэспублікі, у т. л. каля 100 з'яўляюцца гал. пастаўшчыкамі гатовых вырабаў у сваіх галінах прамысловасці СССР. Імпартуюцца ў БССР пераважна машыны, абсталяванне і прылады, а таксама прамысл. тавары шырокага ўжытку, вытворчая і харчовая сыравіна. З выкарыстаннем імпартнага абсталявання за 1961—69 пабудавана і рэканструявана больш як 50 буйных і сярэдніх прадпрыемстваў. Ажыццяўляецца З. г. праз адпаведныя ўсесаюзныя аб'яднанні і канторы. Як член ААН БССР паслядоўна выступае ў міжнар. органах супраць палітыкі дыскрымінацыі ў сусв. гандлі, за яго расшырэнне.

Капіталіст. З. г.— адзін з сродкаў эканам. заняволення і эксплуатацыі інш. краін. Асабліва вялікія прыбыткі атрымліваюць капіталіст. манаполіі ад краін, якія сталі на шлях незалежнага развіцця. Апошнія ад неэквівалентнага гандлю з капіталіст. дзяржавамі за 1961—66 страцілі 13,4 млрд. долараў. Апрача таго, у гандлі з гэтымі краінамі капіталіст. дзяржавы ставяць палітычныя мэты, вядуць гандл. палітыку з агульнай стратэгіяй неакаланіялізму. Гл. таксама *Гандаль, Гандлёвая палітыка.*

Знешнегандлёвы абарот СССР (млн. руб.)

	1946	1960	1965	1969
Усяго	1280	10 073	14 610	19 784
у тым ліку				
з сацыялістычнымі краінамі	698	7371	10 050	12 940
Экспарт	588	5007	7357	10 490
у тым ліку				
ў сацыялістычныя краіны	341	3790	5001	6914
Імпарт	692	5066	7253	9294
у тым ліку				
з сацыялістычных краін	357	3581	5049	6026

Літ.: Золотарев В. И. Мировой социалистический рынок, М., 1969; 50 лет советской внешней торговли, М., 1967; Воронов К. Г. и Павлов К. А. Организация и техника внешней торговли, М., 1970.

П. І. Нескаромны. Мінск.

ЗНЕШНЯЯ ПАЗЫКА, гл. ў арт. *Пазыка.*

ЗНІШЧАЛЬНА - БАМБАРДЗІРОВАЧНАЯ АВІЯЦЫЯ, род ваенна-паветраных сіл, асн. ударная сіла франтавой авіяцыі, прызначаная знішчаць ядзерныя сродкі і іншыя малапамерныя і рухомыя наземныя цэлі ў тактычнай і найбліжэйшай аператыўнай глыбіні праціўніка. Можа таксама выкарыстоўвацца для барацьбы з авіяцыяй і беспілотнымі сродкамі нападу праціўніка, для паветр. разведкі.

ЗНІШЧАЛЬНАЯ АВІЯЦЫЯ, род ваенна-паветраных сіл, адзін з асн. сродкаў проціпаветранай абароны, прызначаны прыкрываць войскі і аб'екты тылу ад удараў і разведкі ворага з паветра. Гал. задача: знішчэнне ў паветры самалётаў і беспілотных сродкаў паветранага нападу праціўніка. Можа выкарыстоўвацца таксама ў паветр. разведцы, знішчэнні дэсанта ў паветры, забеспячэнні баявых дзеянняў інш. родаў авіяцыі і ў асобных выпадках для паражэння адкрытых наземных цэляў.

ЗНІШЧАЛЬНІК, баявы самалёт, прызначаны знішчаць у паветры самалёты і беспілотныя сродкі паветранага нападу праціўніка (крылатыя ракеты). Можа быць выкарыстаны і для паражэння наземных аб'ектаў. Сучасныя З. маюць электроннае абсталяванне, якое забяспечвае магчымасць перахоплівання самалётаў праціўніка днём і ноччу, ва ўсякіх умовах надвор'я. Узброены пушкамі калібру 20, 23 ці 30 *мм*, кіроўнымі рэактыўнымі снарадамі класаў «паветра — паветра» ці «паветра — зямля», некіроўнымі рэактыўнымі снарадамі, бомбамі. Скорасць звышгукавых З. больш за 3000 *км/гадз*, мяжа вышыні да 30 *км*.

Першы ў свеце З. РБВЗ-С-16 пабудаваны ў Расіі ў 1915. У 2-ю сусв. вайну асн. відам З. быў аднамесны самалёт з поршневым рухавіком; пад канец вайны створаны З. з рэактыўным рухавіком, што значна павялічыла яго скорасць і вышыню лёту. Гл. таксама *Знішчальная авіяцыя, Знішчальна-бамбардзіровачная авіяцыя.* Іл. гл. на ўкл. да арт. *Авіяцыя.*

«ЗНІШЧАЛЬНІК», спецыяльная партыз. група НКДБ БССР, якая ў Айч. вайну змагалася супраць нямец.-фаш. захопнікаў на Беларусі. 4.8.1943 група (23 чал.) перапраўлена ў варожы тыл. Камандзіры: Н. В. Карнілаў (да 30.11.1943), А. Н. Чычэнка (да ліп. 1944). Дзейнічала на тэр. Клічаўскага, Бабруйскага, Асіповіцкага р-наў Магілёўскай вобл., Рагачоўскага, Жлобінскага р-наў Гомельскай вобл., Пухавіцкага, Мінскага, Барысаўскага, Дзяржынскага р-наў Мінскай вобл., Маладзечанскага р-на Вілейскай вобл., Навагрудскага, Лідскага р-наў Баранавіцкай вобл. Партызаны групы пусцілі пад адхон 45 варожых эшалонаў, у т. л. бронецягнік, знішчылі і пашкодзілі 237 вагонаў і платформаў, 7 аўтамашын, мост цераз р. Уса, разбурылі 1 *км* чыгункі, больш за 3 *км* тэлефонна-тэлеграф. ліній. 7.7.1944 група (55 чал.) злучылася з Чырв. Арміяй. *І. С. Барысаў, А. Дз. Рудак.* Мінск.

ЗООВЕТЭРЫНАРНЫЯ ІНСТЫТУТЫ, гл. *Ветэрынарныя і зааветэрынарныя вышэйшыя навучальныя ўстановы.*

ЗООГЕАГРАФІЧНЫЯ ВОБЛАСЦІ (фаўністычныя вобласці), асноўныя адзінкі раянавання сушы і мора паводле складу жывёльнага насельніцтва, найвялікшыя адзінкі падзелу зямнога шара. Вылучаюцца на падставе агульнага складу фаўны, наяўнасці эндэмічных відаў, родаў, сям. і атр., адсутнасці пэўных груп жывёл, існавання характэрных відаў (такіх, што трапляюцца на адпаведнай тэр. ўсюды і ў вял. колькасці). Асн. групы, паводле якіх вылучаюць З. в.,— названочныя. Вялікую ролю ў вызначэнні З. в. мае гісторыя краіны. Межы абласцей, падабласцей, правінцый і інш.— больш-менш шырокія пераходныя палосы. Для марской і наземнай фаўны З. в. розныя, бо неаднолькавыя ў іх умовы існавання. Падзел мораў на З. в. ўскладняецца вертыкальнай занальнасцю. Прыбярэжная, глыбінная і зона адкрытага мора маюць свае З. в. Асаблівасці прэснаводнай фаўны даюць магчымасць падзяляць яе паводле сістэмы, прынятай для фаўны сушы. У сучасным зоагеаграфічным падзеле сушы 6 фаўністычных абласцей.

Упершыню З. в. прапанаваны для птушак англ. заолагам Ф. Л. Склетэрам у 1857. Англ. заолаг А. Уолес у 1876 удакладніў гэты падзел і вылучыў падвобласці. Вобласці аб'ядноўваюць у царствы (rei): Натагею, Неагею, Арктагею (упершыню падзел на Арктагею і Натагею зрабіў англ. натураліст Т. Г. Гекслі, 1868). Арктагейскае царства называюць Мегагеяй (англ. вучоны Ф. Дарлінгтан, 1966), яно аб'ядноўвае б. ч. зямнога шара. Да гэтага царства належаць: Эфіопская вобл.— Афрыка на Пд ад Сахары, Паўд. Аравія; Інда-Малайская вобл.— трапічная Азія з суседнімі мацерыковымі а-вамі; Галарктычная вобл.— Еўропа і Азія на Пн ад тропікаў з паўн. (ад Сахары) часткай Афрыкі, Паўн. Амерыка, акрамя трапічнай часткі Мексікі. Да царства Неагеі належыць Неатрапічная вобл.— Паўд. і Цэнтральная Амерыка з трапічнай Мексікай; да Натагеі — Аўстралійская вобл.— Аўстралія з Новай Гвінеяй і інш. а-вамі (гл. карту на ўкл.). Некат. аўтары вылучаюць Палеагейскае царства, да якога адносяць Інда-Малайскую і Эфіопскую вобл. Акрамя гэтых, зоагеографы апісваюць Антарктычную фаўністычную вобл.

Эфіопская вобл. мае пераважна саванныя і пустынныя ландшафты. Жывуць 38 сям. млекакормячых, у т. л. 13 эндэмічных (жырафы, бегемоты, трубказубы, земляныя ваўкі, даўганогі, тэнрэкі і інш.). Ёсць 6 сям., якія жывуць таксама і ў Інда-Малайскай вобл.: чалавекападобныя малпы, лемуры, слоны, насарогі, пангаліны, алянькі. Шмат капытных: антылопы, вебры, 89 сям. птушак, у т. л. 15 эндэмічных: бананаеды, лясныя ўдоды, мышанкі, кітагаловыя чаплі, сакратары і інш. З паўзуноў — хамелеоны. Ёсць тэрміты, саранчовыя, матылькігалубінкі. Вобл. падзяляецца на Усх.-Афрыканскую, Зах.-Афрыканскую, Паўд.-Афрыканскую і Мадагаскарскую падвобласці.

Інда-Малайская вобл. (Усходняя вобл.) мае разнастайныя прыродныя ўмовы і неаднародную фаўну. Склад ля тыпова трапічны. Шмат млекакормячых: індыйскі буйвал, алені, антылопы, тапіры, 3 віды насарогаў, індыйскі слон, тыгр, пантэра, вавёрка, дзікабразы, малпы. У арнітафаўне павы, фазаны, сапраўдныя куры, нектаркі, мала папугаяў, няма бясконлевых птушак. Паўзуны: кракадзіл, кобра, сеткавы пітон, агамы, сцынкі, чарапахі, эндэмічны род гавіялаў. Земнаводныя: чарвягі, лятучыя жабы. З рыб шмат карпавых, самы. Насякомыя: яркія разнастайныя дзённыя матылькі. З павукападобных тыповы павук-птушкаед. Вобл. мае 2 падвобласці — Індыйска-Індакітайскую і Малайскую.

Галарктычная вобл. найбольшая з З. в., аднак фаўна параўнальна беднал. Есць эндэмічныя групы: з млекакормячых вілароГія антылопы, бабры, пішчухі; з птушак гагары, чысцікі і цецеруковыя. Не выходзяць за межы вобл. асятровыя і ласасёвыя рыбы. Няма паўмалпаў, хобатных, папугаяў, бясхілевых птушак (акрамя афр. страўса), сумчатых, кракадзілаў. Жывуць апосум, скунс, бізон, дзікабраз, белы і буры мядзведзі, расамаха, лось, вавёрка, бурундук, калібры, сцярвятнік, салаўі, малінаўкі, дзятлы, каралькі, валасянкі. Есць архаічныя касцявыя ганоіды — панцырныя шчупакі і аміі. Вобл. падзяляецца на 7 падабласцей: Арктычную, Цыркумбарэальную, Міжземнаморскую, Цэнтральна-Азіяцкую, Кітайска-Гімалайскую, Зах.-Амерыканскую і Усх.-Амерыканскую.

Неатрапічная вобл. рэзка адрозніваецца ад іншых. Мае шэраг эндэмічных формаў. З падкласа сумчатых трапляюцца апосумы, плывуны, эндэмічнае сям. цэналеставых. З непаўназубых — браняносцы; лянівцы, мурашкаеды. Жывуць вампіры. З грызуноў — марскія свінкі, агуці, віскашы, шыншылы: усе яны эндэмікі. З драпежных — ягуар, ацэлот, пума. Капытных мала. Малпы неатрапічнай З. в. належаць да падатр. шыраканосых. Няма хобатных, пустарогіх, гіен, віверау, крыланаў (лятучых сабак). Выключна разнастайная фаўна птушак (26 эндэмічных сям.): трохпальцыя страўсы — нанду, калібры, папугаі, адонгалосыя вераб'іныя, кондары, гарпіі, туканы. Удодаў і цецеруковых няма. З паўзуноў — кайманы, кракадзілы, бакашыйныя чарапахі, яшчаркі. Шмат бясхвостых земнаводных, хвастатых няма. Рыбы маюць шэраг характэрных формаў (двялкадыхальныя, арапайма, піранья). З насякомых — мурашкі, яркія валікія матылі. Вобл. падзяляецца на 3 падвобласці: Гвіяна-Бразільскую, Патагона-Андыйскую і Антыльскую.

Аўстралійская вобл. мае фаўну з мноствам эндэмічных сям. і родаў. Адсутнічаюць многія групы, вельмі пашыраныя на суседніх тэр. Пераважаюць сумчатыя (130 відаў: сумчаты крот, сумчаты воўк, сумчаты мурашкаед, сумчатая вавёрка, шматлікія кенгуру). Толькі тут жывуць аднапраходныя — качканос, яхідна і праехідна. З 286 родаў птушак 95 эндэмічныя: казуары, эму, альтанкавыя і райскія птушкі, лірахвосты, чорны лебедзь. Адсутнічаюць карпавыя рыбы. З жукоў шмат златак і вусачоў. Своеасаблівасць фаўны Аўстралійскай З. в. тлумачыцца яе гісторыяй. У мезазоі Аўстралія злучалася з Азіяцкім мацерыком, пазней з Паўд. Амерыкай. У той час сюды перасяліліся ніжэйшыя млекакормячыя — клаачныя і сумчатыя. Ізаляцыя Аўстраліі спрыяла своеасабліваму развіццю жывёльнага і раслінага свету гэтай вобл. Аўстралійская З. в. падзяляецца на 5 падабласцей: Аўстралійскую, Новазеландскую, Папуаскую, Палінезійскую і Гавайскую.

Антарктычная вобл. мае бедную і своеасаблівую фаўну. Мала наземных жывёл, няма лятучых насякомых, сухапутных млекакормячых, прэснаводных рыб. З птушак ёсць белы сявец, канёк, невялікая качка Anas georgica. Летам прыбярэжныя воды насяляюць буравеснікі, альбатросы, чайкі, паморнікі. Найб. тыповыя птушкі Антарктычнай З. в.: пінгвіны (імператарскі, каралеўскі і пінгвін Адэлі). З млекакормячых жывуць ластаногія і кіты.

Літ.: Бобринский Н. А. и Гладков Н. А. География животных (курс зоогеографии), М., 1961; Гептнер В. Г. Общая зоогеография, М.— Л., 1936; Проблемы зоогеографии суши, Львов, 1958; Воронов А. Г. Биогеография, М., 1963; Дарлингтон Ф. Зоогеография, пер. с англ., М., 1966; Lattin G. Grundriss der Zoogeographie, Stuttgart, 1967.

Р. К. Кажэўнікава. Мінск.

ЗООГЕАГРАФІЯ (*зоа...+геа...+...графія*), геаграфія жывёл, навука пра размяшчэнне на зямным шары жывёльных арганізмаў, пра сувязь гэтага размяшчэння з узаемаадносінамі паміж арганізмамі і з геаграфічнымі ўмовамі асяроддзя. Разам з *геаграфіяй раслін* з'яўляецца часткай *біягеаграфіі*. Мае вял. значэнне для пазнання і выкарыстання прыродных рэсурсаў зямнога шара, спрыяе вывучэнню гісторыі Зямлі, эвалюцыі арганізмаў, пытанняў акліматызацыі і інш. Падзяляецца на апісальную (харалагічную, сістэматычную, фаўністычную і біяцэналагічную З.) і каўзальную (экалагічную і гістарычную З.).

Гал. формы даследаванняў: рэгістрацыя відавога складу, апісанне фаўны, вылучэнне тэрытарыяльных адзінак, якія адрозніваюцца складам фаўны, вывучэнне складу біяцэнозаў, зоагеагр. картаванне (апісальная З., гл. *Зоагеаграфічныя вобласці*), вывучэнне экалагічных або гістар. прычын, якія вызначаюць характар фаўны (каўзальная З.). Сучасная праблема З.— даследаванне жывёльнага насельніцтва тэрыторыі як рухомай сістэмы для разумення геаграфіі назапашвання і трансфармацыі біял. прадукцыі ў розных ландшафтах. У СССР склалася зоагеагр. школа, заснаваная на ідэях М. А. Северцава (М. А. Мензбір, П. П. Сушкін, Л. С. Берг, А. П. Сямёнаў-Цян-Шанскі, Л. А. Зенкевіч, У. Г. Гептнер, І. І. Пузанаў, М. А. Гладкоў і інш.). Заалагічны ін-т АН СССР выдае серыю кніг «Фаўна СССР». Зоагеагр. матэрыялы публікуюцца ў «Зоологическом журнале», «Энтомологическом обозрении» і ў інш. часопісах. На Беларусі пытанні З. вывучаюць у Аддзеле заалогіі і паразіталогіі АН БССР і на заалагічных кафедрах ВНУ. Выдадзены шэраг манаграфій па фаўне рэспублікі і зоагеагр. раянаванні яе тэрыторыі.

Літ.: Гептнер В. Г. Общая зоогеография, М.— Л., 1936; Наумов Г. В. Краткая история биогеографии, М., 1969; Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961; Жуков П. И. Рыбы Белоруссии, Мн., 1965; Федюшин А. В. и Долбик М. С. Птицы Белоруссии, Мн., 1967; Долбик М. С. Опыт зоогеографического районирования Белоруссии, у кн.: Экология позвоночных животных Белоруссии, Мн., 1965; Lattin G.Grundriss der Zoogeographie, Stuttgart, 1967.

І. К. Лапацін. Мінск.

ЗООГІГІЁНА, навука пра ахову здароўя жывёл. Вывучае ўзаемасувязь паміж жывёльным арганізмам і вонкавым асяроддзем, вызначае рацыянальныя ўмовы ўтрымання, догляду, кармлення і выкарыстання, пры якіх жывёла астаецца здаровай і мае максімальную прадукцыйнасць.

З. надае найб. значэнне вонкавым фактарам утрымання жывёлы: саставу паветранага асяроддзя, яго т-ры і вільготнасці, асвятлення, саставу і якасці кармоў і вады, спосабам і распарадку кармлення і паення, шчыльнасці размяшчэння жывёлы і інш. Стварэннем аптымальных гігіенічных умоў можна значна павялічыць прадукцыйнасць жывёлы. Звесткі З.— аснова распрацоўкі агульнапрафілактычных і вет.-сан. мерапрыемстваў, праектавання ферм і інш. с.-г. памяшканняў. На Беларусі даследаванні па З. вядуцца ў Бел. НДІ жывёлагадоўлі, Бел. н.-д. вет. ін-це, Бел. с.-г. акадэміі, Віцебскім вет. ін-це і Гродзенскім с.-г. ін-це. Па З. вядомыя працы Х. С. Гарагляда, А. П. Анегава, А. І. Бабашынскага, І. Я. Голубева, Дз. П. Іванова, У. Ф. Матусевіча, П. Дз. Бажанава, М. Дз. Кракасевіча і інш.

Літ.: Онегов А. П. Гигиена сельскохозяйственных животных, 2 изд., М., 1963; Голубев И. Е. Гигиена выращивания молодняка сельскохозяйственных животных, Мн., 1961.

С. І. Пляшчанка. Жодзіна.

ЗОГАВІЧ (Зоговић) Радаван (н. 19.8.1907, в. Машніцы, Чарнагорыя), чарнагорскі паэт і публіцыст. З сям'і селяніна-бедняка. Студэнтам Бялградскага ун-та ўключыўся ў барацьбу з манарха-фаш. рэжымам Югаславіі. У 30-я г. супрацоўнік і рэдактар прагрэс. літ. часопісаў. За рэвалюц. дзейнасць і сімпатыі да СССР зазнаў ганенне. У 2-ю сусв. вайну дзеяч партыз. руху. Аўтар зб. вершаў «Агністыя галубы» (1939), «Упартыя строфы» (1947), цыкла «Прышэльцы — песні Аліс-Бінака» (1957), зб. артыкулаў «На полі бою» (1947). Перакладаў вершы У. Маякоўскага. На бел. мову паасобныя вершы З. пераклаў Н. Гілевіч.

Тв.: Рус. пер.— Упрямые строфы, М., 1968.

ЗОЛАТА (Aurum), Au, хімічны элемент I групы перыядычнай сістэмы Мендзялеева, ат. нумар 79, ат. м. 196,97. Вядома з глыбокай старажытнасці. У зямной кары $5 \cdot 10^{-7}$% па масе.

У прыродзе трапляецца пераважна ў свабодным стане ў выглядзе дробных украплванняў у розных рудах і ў выглядзе самародкаў, маса якіх часам дасягае некалькіх кілаграмаў. Шчыльн. 19,32 *г/см*³, *t* пл. 1063 °С, *t* кіп. 2847 °С. З.— адзін з высакародных металаў, мае малую хім. актыўнасць. У злучэннях праяўляе валентнасць I і III. З кіслародам, азотам, вадародам і вугляродам не рэагуе нават пры высокіх т-рах. Растварaецца ў сумесі азотнай і салянай к-т («царская гарэлка»). Выкарыстоўваецца ў ювелірных вырабах, у паўправадніковых і інш. прыладах, у выглядзе хім. прэпаратаў — у фатаграфіі.

Як каштоўны метал З. ва ўмовах таварнай вытв. з'яўляецца *ўсеагульным эквівалентам*. Разам з серабром вылучылася сярод тавараў сваімі ўласцівасцямі — трываласцю, аднароднасцю, падзельнасцю, партатыўнасцю, зручнасцю ў хаванні, што абумовіла пераход ролі *грошай* да гэтых металаў. Першыя звесткі пра выкарыстанне З. як грошай адносяцца да 1500 да н. э., як сродак абарачэння пашырана з 18—19 ст. У перыяд агульнага крызісу капіталізму, які абвастрыў супярэчнасці капіталіст. свету, *залаты стандарт* церпіць крах. Спыняецца размен крэдытных білетаў на З., абмяжоўваецца або забараняецца яго вывад і куплі-продаж. З. траціць функцыю сродку абарачэння і выконвае функцыі меры вартасці, скарбаў і сусв. грошай. Ва ўмовах папераграшовага абарачэння становіцца своеасаблівым таварам і набывае цану афіцыйную (35 дол. за унцыю чыстага З.) і рынкавую. Прадаецца злёткамі і манетамі і ідзе на папаўненне цэнтралізаваных (дзярж.) запасаў (гл. *Залаты запас*); тэзаўрацыйных (прыватных) скарбаў; на патрэбы прамысловасці, ювелірнай справы, медыцыны. Рынкі З. ў Лондане, Цюрыху, Парыжы, Бейруце, Ганконзе, Токіо, Сінгапуры, Дакары, Нью-Йорку.

Сярод капіталіст. краін З. здабываюць 60: найбольш Паўд.-Афрыканская Рэсп. (у 1969 — 77% здабычы капіталіст. краін), Канада, ЗША, Аўстралія, Гана, Японія (гл. табл.).

Здабыча золата ў капіталістычных краінах

	1937	1948	1969
Усяго, *т*	932,0	698,0	1260,0
у тым ліку			
Паўд.-Афрыканская Рэсп.	365,0	360,0	975,0
Канада	127,9	110,1	75,0
ЗША	127,9	63,0	48,0
Гана	17,4	20,9	22,6
Аўстралія	43,1	27,5	21,8
Японія	23,0	3,1	21,1

Вакол размеркавання залатога запасу, цаны З., яго здабычы, выкарыстання ў міжнар. разліках ідзе барацьба. Імперыял. дзяржавы імкнуцца да валютнай гегемоніі ў міжнар. сферы, праводзяць палітыку выцяснення З. з сусв. эканомікі. ЗША навязваюць інш. капіталіст. краінам замест З. долар, а *Міжнародны валютны фонд*, які абараняе інтарэсы манапаліст. капіталу,— міжнародныя рэзервова-разліковыя адзінкі СДР (Special Drawing Rights — спецыяльныя правы на атрыманне валюты).

У СССР і інш. сацыяліст. краінах З. садзейнічае ўмацаванню нац. суверэнітэту ў эканам. сувязях з капіталіст. краінамі на аснове *валютнай манаполіі*. Забяспечвае вартасць банкаўскіх білетаў і разам з інш. таварамі — устойлівасць валюты. Выкарыстоўваецца ў планавым парадку як мера вартасці і як сусв. плацежны сродак.

Літ.: Маркс К. Да крытыкі палітычнай эканоміі, Мн., 1952; Ягож. Капітал, т. 1, Мн., 1952; Ленін У. І. Аб значэнні золата цяпер і пасля поўнай перамогі сацыялізма, Тв., т. 33 (Полн. собр. соч., т. 44); Борисов С. М. Золото в экономике современного капитализма, М., 1968; Валюты стран мира. Справочник, М., 1970; Соболевский В. И. Благородные металлы. Золото, М., 1970.

В. А. Драздоў. Мінск.

ЗОЛАЎ Аляксей Ільіч [н. 10(23).1.1906, Пінск], парт. і дзярж. дзеяч БССР. З рабочых. Чл. КПСС з 1930. Скончыў Ленінградскі політэхнічны ін-т (1936). З 1936 гал. энергетык, гал. механік, дырэктар станкабудаўнічага з-да імя Кірава ў Мінску. З 1941 у Наркамаце станкапрома СССР, дырэктар Клінскага станкабудаўнічага з-да, дырэктар станкабудаўнічага з-да імя Кірава ў Мінску; з 1946 сакратар Мінскага гаркома КПБ. У 1947—57 нам. старшыні Савета Міністраў, міністр лёгкай і харч. прамысловасці, харч. тавараў БССР. У студз. 1957 выбраны сакратаром ЦК КПБ. З мая 1957 першы нам. старшыні Савета Міністраў БССР і старшыня Савета нар. гаспадаркі БССР. З вер. 1958 нам. старшыні Савета Міністраў БССР. На XIX, XXIII—XXVI з'ездах КПБ выбіраўся чл. ЦК, на XXIII—XXVI — чл. Бюро ЦК КПБ. Дэп. Вярх. Савета СССР 5-га скл., Вярх. Савета БССР 2—7-га скл. Узнаг. ордэнам Леніна, 4 інш. ордэнамі, медалямі.



ЗОЛІ (ад лац. solulio раствор), калоідныя сістэмы, якія складаюцца з часцінак дробнараскрышанага цвёрдага цела, дробных кропель вадкасці ці газу, раўнамерна размеркаваных у якім-н. асяроддзі. З.— *гетэрагенная сістэма*; рэчыва раскрышана ў растваральніку (дысперсійнае асяроддзе) да вельмі маленькіх (10^{-7}—10^{-5} *см*) часцінак (дысперсная фаза).

Наяўнасць вялікай паверхні падзелу паміж дысперсійным асяроддзем і дысперснымі часцінкамі адрозніваe З. ад сапраўдных растворaў і ў многім вызначае іх уласцівасці. З.— тэрмадынамічна нясстойлівыя сістэмы і могуць каагуляваць (гл. *Каагуляцыя*). Сваю назву часта атрымліваюць ад прыроды растваральніка. Калі гэта вада — гідразолі; калі спірт або бензол — алказолі, бензазолі; калі паветра — аэразолі; калі любое арганічнае рэчыва — арганазолі. З., атрыманыя ў распладзленым асяроддзі,— піразолі, З., якія існуюць пры нізкіх т-рах,— крыязолі. З. з любым вадкім асяроддзем наз. ліязолямі. Іншы раз у назве адлюстроўваюць прыроду дысперсійнага асяроддзя і дысперснай фазы, напр. гідразоль золата і інш. Гл. таксама *Дысперсныя сістэмы*.

Літ.: Гл. пры арт. *Калоідная хімія*.

М. Ф. Ярмоленка. Мінск.

ЗОЛЬКІ, вёска ў Іжскім с/с Вілейскага р-на Мінскай вобл. Цэнтр калгаса імя Кірава. За 40 *км* на ПнЗ ад Вілейкі, 143 *км* ад Мінска. 133 ж., двароў 43 (1971). Клуб, б-ка, швейная і шавецкая майстэрні, магазін. Помнік 46 землякам, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗО́МБА (Zomba), сталіца Малаві, на Пд краіны, у Паўд. правінцыі, на схілах гары Зомба. Аэрапорт. 19 тыс. ж. (1966). Гандл. цэнтр с.-г. раёна, с.-г. доследная ст. Кліматычны курорт.

ЗО́НА (у музыцы), вобласць, у межах якой пэўны гук або інтэрвал пры розных колькасных выражэннях захоўвае сваю якасць і назву.

Напр., гук *ля* 1-й актавы ўспрымаецца як нязменны пры частотах 435, 440, 443 *гц* і інш. Гэтая з'ява абумоўлівае т. зв. свабоднае інтанаванне музыкі спевакамі ці выканаўцамі на інструментах з часткова фіксаваным строем (скрыпка і інш.). Зонная прырода слыху выяўляецца не толькі адносна вышыні гуку, але і адносна тэмпу, рытму, тэмбру, дынамікі.

ЗО́НА ГЕАГРАФІ́ЧНАЯ, зона прыродная (грэч. zōnē пояс), адзінка шыротна-занальнага фізіка-геаграфічнага падзелу зямной паверхні. Вылучаецца як частка *пояса геаграфічнага*. Для пэўнай З. г. характэрны аднолькавы клімат, глебава-расліннае покрыва, пэўныя рысы рэжыму гідрасеткі, сучасных геамарфалагічных і геахімічных працэсаў і асаблівасці жывёльнага свету.

На сушы З. г. вылучаны пераважна з З на У і зменьваюць адна адну з Пн на Пд. На тэр. СССР вылучаюцца: *лядовая зона* (арктычны пояс), *тундраў зона, лесатундра* (субарктычны пояс), *лясная зона, лесастэпавая зона, стэпавая зона, паўпустынь зона, пустынь зона* (умераны пояс), *субтропікі* (субтрапічны пояс).

ЗО́НАЎ Панцялей Пятровіч [н. 30.6(13.7). 1913, в. Зонава Бузулуцкага пав. Самарскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1941. Вызначыўся ў Палескай вобл. 28.9.1943 нам. камандзіра батальёна па палітчастцы З. над агнём праціўніка кіраваў пераправаю цераз Дняпро. На захопленым плацдарме батальён адбіў 11 контратак. Жыве ў Растове-на-Доне.


«ЗО́НД», назва савецкіх аўтаматычных міжпланетных станцый (АМС) для вывучэння касмічнай прасторы і адпрацоўкі тэхнікі далёкіх касмічных палётаў. Маюць сістэму арыентацыі, рухальную ўстаноўку, з дапамогай якой пры неабходнасці робіцца карэкцыя траекторыі палёту, сістэмы далёкай радыёсувязі, комплекс навуковай апаратуры і інш.

«З.-1» запушчаны 2.4.1964 у эксперыментальных мэтах з борта цяжкага спадарожніка, выведзенага на арбіту вакол Зямлі. «З.-2» стартаваў 30.11.1964 у бок Марса. На борце былі эксперым. плазмавыя рухавікі. «З.-3» запушчаны 18.7.1965, на станцыі ўстаноўлена фотатэлевізійная апаратура, з дапамогай якой 20 ліп. адбылося фатаграфаванне адваротнага боку Месяца і перадача адлюстравання на Зямлю. «З.-4» стартаваў 2.3.1968. Мэта запуску — вывучэнне далёкіх зон каллязмнай касм. прасторы і адпрацоўка новых бартавых сістэм і агрэгатаў АМС. Запускам АМС «З.-5» і «З.-6» (новая серыя АМС) упершыню вырашана праблема вяртання на Зямлю касм. апарата, які ўваходзіць у атмасферу Зямлі з другой касм. скорасцю. АМС «З.» новай серыі складаецца з прыладнага адсека і спускальнага апарата. Перад уваходам станцыі ў атмасферу Зямлі спускальны апарат аддзяляецца ад прыладнага адсека. «З.-5» запушчаны 15.9.1968. Станцыя 18 вер. абляцела Месяц на адлегласці 1950 км ад яго паверхні. На борце знаходзіліся чарапахі, дразафілы, вярняты пшаніцы, ячменю і інш. біялагічныя аб'екты для вывучэння ўздзеяння на іх умоў касм. палёту. Пры вяртанні АМС сфатаграфавала Зямлю на адлегласці 90 тыс. км, спускальны апарат прызямліўся 21 вер. ў Індыйскім ак. АМС «З.-6» стартавала 10.11.1968. У час палёту ўпершыню вырашана складаная задача кіроўнага спуску ў зададзены раён касм. апарата, які абляцеў Месяц; праведзены два сеансы фатаграфавання Месяца і навук. вымярэнні фіз. характарыстык калямесячнай касм. прасторы. 17 ліст. спускальны апарат станцыі прызямліўся ў зададзеным раёне СССР. «З.-7» запушчаны 8.8.1969, абляцеў Месяц і вярнуўся на Зямлю. Асн. мэта запуску — тэхн. эксперыменты па адпрацоўцы ўдасканаленых сістэм, апаратуры і канструкцыі станцыі. У час палёту праведзены сеансы каляравога фатаграфавання Зямлі і Месяца. 14 жн. спускальны апарат зрабіў мяккую пасадку паблізу г. Кустанай. «З.-8» стартаваў 20.10.1970 у кірунку да Месяца. Мэта запуску — фіз. даследаванні на трасе палёту і ў калямесячнай прасторы, фатаграфаванне Зямлі і Месяца на розных адлегласцях і інш. На высакагорнай абсерваторыі Дзярж. астранамічнага ін-та імя Штэрнберга ў гарах Заілійскага Алатау зроблены фотаздымак «З.-8» на адлегласці 348 тыс. км. 24 кастр. станцыя абляцела Месяц на адлегласці 1120 км ад яго паверхні, 27 кастр. спускальны апарат прызямліўся ў Індыйскім ак. Гл. таксама *Аўтаматычная месячная станцыя, «Месяц»*.

А. К. Шычалін. Масква.

ЗО́НДСКІ ПРАЛІ́Ў, у Інданезіі, паміж а-вамі Суматра і Ява. Злучае Яванскае м. з Індыйскім ак. Даўж. 120,3 *км*, шыр. 22—105 *км*, найм. глыбіня на фарватэры каля 50 *м*. У З. п. вулкан Кракатау.

ЗО́ННАЯ ТЭО́РЫЯ, раздзел квантавай тэорыі, які апісвае паводзіны валентных электронаў крышталя ў перыядычным полі крышталічнай рашоткі. Дае якаснае тлумачэнне, а ў шэрагу выпадкаў і колькаснае апісанне цеплавых, электрычных, магнітных, аптычных уласцівасцей цвёрдых целаў, а таксама кантактавых, паверхневых і інш. з'яў.



Пры збліжэнні асобных ізаляваных атамаў, якія ўтвараюць крышталі, узаемадзеянне паміж імі вядзе да зрушэння, расшчаплення і расшырэння *ўзроўняў энергіі* атамных электронаў: замест энергетычных узроўняў (1, 2, 3) узнікаюць энергетычныя зоны (1*a*, 2*a*, 3*a*; гл. рыс.). Найб. узбураюцца пры гэтым узроўні знешніх — валентных электронаў. Такія электроны ў крышталі перастаюць належаць асобным атамам; дзякуючы *тунельнаму эфекту* час знаходжання электрона каля асобнага атама не перавышае $\sim 10^{-15}$ *сек*. Т. ч., крышталь нагадвае гіганцкую малекулу, якая мае *Nn* валентных электронаў (*N* — лік атамаў у крышталі, *n* — лік валентных электронаў на адну атамную ячэйку). Энергетычныя ўзроўні *Nn* электронаў утвараюць зону пры ўзаемадзеянні *N* аднолькавых пачатковых узроўняў валентных электронаў. Паводле *Паўлі прынцыпу*, у *N* станах зоны не можа знаходзіцца больш як 2*N* электронаў. Калі зона запоўнена цалкам, электроны ў ёй не могуць пераразмяркоўвацца пры якім-н. знешнім энергетычным уздзеянні. У гэтым выпадку знешняе эл. поле не выклікае эл. току — цела з'яўляецца ізалятарам (гл. *Дыэлектрыкі*). Пры часткова запоўненай зоне электроны пад дзеяннем знешняга эл. поля, пераразмяркоўваючыся на вакантных узроўнях, утвараюць эл. ток — цела з'яўляецца правадніком (гл. *Металы*). У целах, што маюць не вельмі вялікую розніцу энергій ($\Delta E \sim 1-2$ *эв*) паміж цалкам запоўненай (валентнай) зонай і верхняй свабоднай зонай (зонай праводнасці), за кошт цеплавога руху можа ўзнікнуць эл. праводнасць, якая моцна залежыць ад тэмпературы. У такіх целах (т. зв. *паўправадні-*

ках) у пераносе заряду ўдзельнічаюць як электроны праводнасці (уласная ці электронная праводнасць), так і вакансіі («дзіркі») валентнай зоны (дзірачная праводнасць).

Літ.: Киреев П. С. Физика полупроводников, М., 1969; Зейтц Ф. Современная теория твердого тела, пер. с англ., М.— Л., 1949; Слэтер Дж. Диэлектрики, полупроводники, металлы, пер. с англ., М., 1969.

Г. С. Рамана́ў. Мінск.

ЗО́РАЎ (сапр. Штокляид) Міхаіл Абрамавіч (1903—28.7.1942), беларускі савецкі акцёр і рэжысёр. Засл. арт. БССР (1938). Сцэн. дзейнасць пачаў у рус. т-рах. З 1926 акцёр, потым і рэж. БДТ-1 (т-р імя Я. Купалы). Выконваў ролі герояў і характарныя. Мастацтва З. вызначалася тонкім псіхалагізмам. З роляў: Войшалак («Вір» Я. Рамановіча), камісар Фурманаў («Мяцеж» паводле Дз. Фурманава), Скрылёў («Гута» Р. Кобеца), Евель Цывін («Бацькаўшчына» К. Чорнага), Платон Крэчат (аднайм. п'еса А. Карнейчука). Пастаноўкі: «Лён» Е. Міровіча (1931, з аўтарам), «Платон Крэчат» (1936), «Апошнія» М. Горкага (1937, з І. Раеўскім), «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча (1938) і інш. Адначасова З. у 1934—37 маст. кіраўнік Бел. ТРАМа ў Мінску. Паставіў: «Працяг будзе» А. Бруштэйн (1934), «Музыканцкую каманду» Д. Дэля (1936) і інш. Загінуў у гета ў Мінску. Узнаг. ордэнам «Знак Пашаны».

Літ.: Стэльмах У. Міхаіл Зораў, у кн.: Слова пра майстроў сцэны, Мн., 1967.

А. К. Сапнікаў. Мінск.

ЗО́РГЕ Рыхард (псеўд. Аляксандр Джонсан; 4.10.1895, с. Аджыкенд Бакінскай губ.— 7.11.1944), савецкі разведчык, Герой Сав. Саюза (1964). Д-р сацыялагічных н. (1919). З сям'і інжынера. Чл. кампартыі Германіі з 1919, чл. КПСС з 1925. Вучыўся ў Кільскім ун-це на мед. ф-це, потым на ф-це сацыялогіі і палітэканоміі. У 1-ю сусв. вайну ваяваў рэвалюц. работу сярод матросаў, удзельнічаў у паўстанні маракоў Кіля (1918). У 1920—21 рэдактар парт. газеты ў Золінгене. Удзельнік гамбургскага паўстання, рэвалюц. баёў у Саксоніі, падпольнай работы ў Франкфурце. З 1925 у СССР, з 6.9.1933 у Японіі. У Токіо стварыў разведвальную групу «Рамзай», у якую ўваходзілі журналісты Х. Адзакі і Б. Вукеліч, камерсант М. Клаўзен і мастак І. Міягі. Група перадавала ў Цэнтр важную інфармацыю пра мадэрнізацыю яп. арміі на герм. ўзор, агляд ваен. прамысловасці Японіі, пра колькасны склад Квантунскай арміі. За тры месяцы да Вял. Айч. вайны раскрыў планы гітлераўскага генштаба і паведаміў дату (20—22 чэрв.) нападу фаш. Германіі на СССР; у сярэдзіне 1941 — што Японія не гатова да нападу на СССР. 18.10.1941 арыштаваны яп. паліцыяй, у вер. 1943 прыгавораны да пакарання смерцю, у 1944 павешаны ў Токіо. Яго імем названа вуліца ў Маскве.



Літ.: Чекисты. Сб., М., 1970, с. 149—167; Корольков Ю. Человек, для которого не было тайн (Рихард Зорге), М., 1966; Будкевич С. Л. «Дело Зорге». Следствие и судебный процесс, М., 1969.

В. С. Семенякоў. Мінск.

ЗО́РГЕ (Sorge) Фрыдрых Альберт (9.11. 1828—26.10.1906), нямецкі марксіст, дзеяч міжнар. і амерыканскага рабочага руху, вучань і паплечнік К. Маркса і Ф. Энгельса. Удзельнік Бадэнскага паўстання 1849, пасля паражэння якога эміграваў у Швейцарыю, адкуль быў высланы ў Бельгію; у 1852 перасяліўся ў ЗША. Актыўна ўдзельнічаў у амер. рабочым руху, быў арганізатарам секцый 1-га Інтэрнацыянала ў ЗША; у 1872—74 ген. сакратар Ген. савета 1-га Інтэрнацыянала. Адзін з першых гісторыкаў-марксістаў. Напісаў шэраг артыкулаў па гісторыі амер. рабочага руху. Падрыхтаваў выданне сваёй перапіскі з К. Марксам, Ф. Энгельсам і інш. дзеячамі рабочага руху (1906, рус. пер. з прадмовай У. І. Леніна ў 1907).

Літ.: Маркс К. и Энгельс Ф. Избр. письма, М., 1953 (гл. Паказальнік імён); Ленін У. І. Прадмова да рускага перакладу кнігі «Пісьмы І. Ф. Бекера, І. Дыцгена, Ф. Энгельса, К. Маркса і інш. да Ф. А. Зорге і інш.», Тв., т. 12 (Полн. собр. соч., т. 15); Румянцева Н. С. Фридрих Зорге — человек упрямой справедливости, М., 1966.

ЗО́РКАЎКА (Stellaria), род адна-, двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. гваздзіковых. Вядома каля 100 відаў, пашыраных па ўсім зямным шары. У СССР 56 відаў, па Беларусі 8.



Зоркаўка багнавая.

Сцябло сцелецца, бывае прамастойнае, выш. (даўж.) 10—60 *см*. Лісце лінейна-ланцэтнае або яйцападобнае. Кветкі белыя, сабраныя ў паўпарасонікі. Плод — каробачка. На Беларусі найб. вядомыя — З. сярэдняя, макрыца (S. media, нар. назвы: макруха, макрэц белы) — пустазелле; З. ланцэтападобная (S. holostea) — меданос, расце ў шыракалістых і мяшаных лясах; З. злакавая, п'янай трава (S. graminea), расце на сухадольных і залітых лугах, у лесе, атрутная для коней і буйн. раг. жывёлы; З. багнавая (S. alsine), расце на балотах.

Літ.: Флора БССР, т. 2, Мн., 1949.

ЗО́РКІ, гіганцкія распаленыя газавыя шары, якія з'яўляюцца асноўнымі крыніцамі энергіі ў космасе і змяшчаюць значную (відаць, асноўную) долю масы ўсяго касмічнага рэчыва.

З. знаходзяцца ад нас вельмі далёка, таму мы бачым іх на небасхіле кропкамі, якія свецяцца. Сонца — адна са звычайных зорак, і бачым мы яго як дыск, а не кропку, бо яно значна бліжэй да нас. Прамыя назіранні даюць толькі бачную яркасць З., т. зв. *зорную велічыню* (гл. табл.), і бачнае становішча на небасхіле, якое вызначаецца дзвюма вуглавымі пераменнымі — схіленнем і прамым узыходжаннем (гл. *Нябесныя каардынаты*). Ні вока, ні тэлескоп не гавораць нічога пра адлегласці да З. Да паралъкальна блізкіх З. адлегласць можна вызначыць на паралаксе — улъным зруху З. на небасхіле ў выніку вярчэння Зямлі вакол Сонца. Адлегласці да далёкіх З. вызначаюць ускоснымі метадамі. Дзве З. могуць здавацца нам суседзямі, а на самай справе быць вельмі далёка адна ад адной з-за розніцы ў адлегласці да Зямлі. Аб'яднанне З. у сузор'і — умоўнае і не паказвае іх сапраўднай блізкасці. Бачная зорная велічыня не дае звестак пра свяцімасць (энергетычную ма-

гутнасць) З., пакуль не вядома адлегласць да яе. *Спектральны аналіз* і тэарэтычныя разлікі даюць магчымасць вызначыць хім. састаў рэчыва З. Яны складаюцца пераважна з вадароду і гелію, астатніх элементаў калі 1—3%. Есць З. анамальнага хім. саставу з перавагай тых ці іншых элементаў: гелію, літыю, барыю, вугляроду, жалеза і інш. Звесткі пра ўнутр. будову З. атрымліваюцца шляхам вывучэння матэматычных мадэляў З. і іх параўнання з рэальнымі З. Крыніцамі энергіі ў недрах звычайных З. лічацца *тэрмаядзерныя рэакцыі* пры т-рах не ніжэй за 10—15 млн. градусаў, калі вадарод пасля шэрагу ядз. працэсаў ператвараецца ў гелій. Асноўная частка энергіі пераходзіць у цеплыню і выпрамяняецца. З., у якіх вадарод з'яўляецца ядз. палівам, наз. З. галоўнай паслядоўнасці, да іх належыць пераважная большасць звычайных З. Калі вадарод вычарпаны, у глыбіні З. ўтвараецца выгаралае геліевае ядро, пасля чаго ядро З. сціскаецца, а абалонка расшыраецца. Пачынаецца эвалюцыя З., якая вядзе да стадыі чырвонага гіганта. У шчыльным ядры т-ра павышаецца да соцень млн. градусаў і пачынаюцца ядзерныя рэакцыі гелію з утварэннем вугляроду і больш цяжкіх элементаў. На паверхні раздзьмутай абалонкі т-ра, наадварот, паніжаецца, гэтым тлумачыцца чырвоны колер такіх З. Канчатковыя стадыі эвалюцыі З. розныя ў залежнасці ад іх масы. Эвалюцыя З. малой масы канчаецца спакойным сціскannем, а З. вялікай масы — грандыёзным выбухам. У першым выпадку ўтвараюцца шчыльныя гарачыя З. вельмі малых памераў — белыя карлікі. Зорныя выбухі называюцца ўспышкамі *звышновых зорак* («звышновых» — таму, што іх звычайна ўдаецца заўважыць толькі ў час успышкі). Пасля ўспышкі астаюцца газавая туманнасць і звышшчыльная нейтронная З. *(пульсар)*, якія выяўляюцца па своеасаблівых радыёвыпрамяненнях.

Найбольш яркія зоркі

Зоркі і сузор'і	Бачная зорная велічыня
Сірыус (Вялікі Пёс)	−1,3
Канопус (Кіль)	−0,9
α Цэнтаўра	0,3
Вега (Ліра)	0,1
Капэла (Вознік)	0,2
Арктур (Валапас)	0,2
Рыгель (Арыён)	0,3
Працыён (Малы Пёс)	0,5
Ахернар (Эрыдан)	0,6
Альтаір (Арол)	0,9

Літ.: Агекян Т. А. Звезды, галактики, Метагалактика, 2 изд., М., 1970; Франк-Каменецкий Д. А. Физические процессы внутри звезд, М., 1959; Ягож. Ядерная астрофизика, М., 1967.

Д. А. Франк-Камянецкі Масква.

«ЗОРКІ», штомесячны дзіцячы часопіс Народнага камісарыята асветы Беларусі, які выдаваўся ў Мінску з лют. 1921 да чэрв. 1922 на бел. мове. Публікаваў творы бел. пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, М. Чарота, Я. Журбы і інш.; матэрыялы пра жывёльны і раслінны свет, па мастацтве, музыцы. Меў аддзел «Для малых дзетак», у якім змяшчаліся апісанні гульняў, загадкі, песні з нотамі і інш. Выйшла 10 нумароў. Рэдактар З. Бядуля.

ЗОРНАЕ НЕБА, сукупнасць свяцілаў, бачных на начным небе. У ясную бязмесячную ноч простым вокам можна бачыць адначасова каля 2,5 тыс. зорак (да 6-й зорнай велічыні), большасць якіх размешчана паблізу палосы Млечнага Шляху, а ўсяго на небе (у абодвух паўшар'ях) налічваецца каля 6 тыс. зорак да 6-й зорнай велічыні. У тэлескопы ж можна назіраць каля 15 тыс. зорак да 7-й зорнай велічыні, каля 350 тыс.— да 10-й, 32 млн.— да 15-й і г. д. Тэлескопы даюць магчымасць выяўляць *зорныя скопішчы, зорныя асацыяцыі*, галактычныя туманнасці, *галактыкі* (некаторыя з пералічаных аб'ектаў назіраюцца і простым вокам), *квазары*, скопішчы галактык і інш. На З. н. бачны *планеты, спадарожнікі планет, малыя планеты, кометы, метэоры*. Само неба таксама свеціцца з прычыны атамных працэсаў у іанасферы. Выгляд начнога З. н. бесперапынна мяняецца з прычыны сутачнага вярчэння Зямлі вакол сваёй восі і гадавога руху яе вакол Сонца і таму, што целы Сонечнай сістэмы ўвесь час перамяшчаюцца сярод зорак. З даўніх часоў нябесныя свяцілы былі і астаюцца надзейнымі арыенцірамі: па іх чалавек можа вызначаць напрамак пунктаў гарызонта і сваё месца знаходжання на сушы, на моры, у паветры і ў космасе. Сігналы дакладнага часу па радыё таксама кантралююцца пастаяннымі назіраннямі нябесных свяцілаў. Для зручнасці арыенціроўкі З. н. ўмоўна падзелена на ўчасткі — сузор'і (гл. табл. на с. 597); падзел зорак на гал. сузор'і адносіцца да глыбокай старажытнасці. Яркія зоркі ў сузор'ях абазначаюцца літарамі грэч. алфавіта, некаторыя з іх маюць уласныя назвы грэчаскага ці арабскага паходжання (гл. *Зоркі*). Больш слабыя абазначаюцца назваю таго ці іншага каталога і нумарамі, пад якімі яны ў каталозе значацца. Такім жа спосабам абазначаецца большасць галактык, галактычных туманнасцей, радыёастр. аб'ектаў і інш. З. н. адлюстроўваюць на глобусах і картах. Карту З. н. гл. на ўклейцы.

Літ.: Зигель Ф. Ю. Сокровища звездного неба. Путеводитель по созвездиям, 2 изд., М., 1968; Дагаев М. М. Наблюдения звездного неба, М., 1969; Селешников С. И. Азбука звездного неба, Л., 1963; Уллерих К. Ночи у телескопа. Путеводитель по звездному небу, пер. с нем., М., 1966.

М. П. Ерпылёў. Масква.

ЗОРНАЯ АСТРАНОМІЯ, раздзел *астраноміі*, які вывучае будову зорных сістэм — Галактыкі, падсістэм аб'ектаў розных фізічных тыпаў, што ўваходзяць у яе склад, зорных скопішчаў і інш. Даследуе рух зорак і іншых аб'ектаў у прасторы (зорная кінематыка), агульныя дынамічныя ўласцівасці зорных сістэм (зорная дынаміка), а таксама статыст. заканамернасці, якія звязваюць розныя характарыстыкі аб'ектаў. Вывады З. а. памагаюць зразумець эвалюцыю асобных аб'ектаў і іх сукупнасцей. З. а. характэрна выкарыстанне масавага назіральнага матэрыялу і дастасаванне статыстычных метадаў даследавання.

Асн. праблемы пры вывучэнні будовы Галактыкі — бачнае і прасторавае размеркаванне аб'ектаў, лакалізацыя і прырода спіральных рукавоў, будова галактычнага ядра. Вывучэнне Галактыкі вельмі ўскладняецца ў сувязі з месцам знаходжання Сонца ўнутры сістэмы, абмежаванасцю прасторы, даступнай назіранням, і наяўнасцю міжзорнай

Спіс сузор'яў

Беларуская назва	Лацінская назва	Становішча на З. н.	Беларуская назва	Лацінская назва	Становішча на З. н.
1	2	3	1	2	3
Авен	Aries	Пн	Лятучая Рыба	Volans	Пд
Аднарог	Monoceros	Э	*Малая Мядзведзіца* (нар. назва Малы Воз)	Ursa Minor	Пн
Актант	Octans	Пд	Малы Конь	Equuleus	Пн
Андрамеда	Andromeda	Пн	Малы Леў	Leo Minor	Пн
Арол	Aquila	Э	Малы Пёс	Canis Minor	Пн
Арыён	Orion	Э	Мікраскоп	Microscopium	Пд
Ахвярнік	Ara	Пд	Муха	Musca	Пд
Блізняты	Gemini	Пн	Навугольнік	Norma	Пд
Вадалій	Aquarius	Э	Насос	Antlia	Пд
Валапас	Bootes	Пн	Паўднёвая Гідра	Hydrus	Пд
Валасы Веранікі	Coma Berenices	Пн	Паўднёвая Карона	Corona Austrina	Пд
Ветразі	Vela	Пд	Паўднёвая Рыба	Piscis Austrinus	Пд
Вознік	Auriga	Пн	Паўднёвы Трыкутнік	Triangulum Australe	Пд
Воран	Corvus	Пд	Паўлін	Pavo	Пд
Воўк	Lupus	Пд	Паўночная Карона	Corona Borealis	Пн
Вялікая Мядзведзіца (нар. назва Вялікі Воз)	Ursa Major	Пн	*Пегас*	Pegasus	Пн
Вялікі Пёс	Canis Major	Пд	*Персей*	Perseus	Пн
Гадзіннік	Horlogium	Пд	Печ	Fornax	Пд
Геркулес	Hercules	Пн	Разец	Caelum	Пд
Гідра	Hydra	Пд	Райскі Птах	Apus	Пд
Голуб	Columba	Пд	*Рак*	Cancer	Пн
Гончыя Псы	Canes Venatici	Пн	*Рыбы*	Pisces	Э
Дзева	Virgo	Э	Рысь	Lynx	Пн
Дракон	Draco	Пн	Секстант	Sextans	Э
Дэльфін	Delphinus	Пн	Сетка	Reticulum	Пд
Журавель	Grus	Пд	*Скарпіён*	Scorpius	Пд
Жывапісец	Pictor	Пд	*Скульптар*	Sculptor	Пд
Жырафа	Camelopardalis	Пн	Сталовая Гара	Mensa	Пд
Залатая Рыба	Dorado	Пд	Страла	Sagitta	Пн
Заяц	Lepus	Пд	*Стралец*	Sagittarius	Пд
Змеяносец	Ophiuchus	Э	*Трыкутнік*	Triangulum	Пн
Змяя	Serpens	Э	Тукан	Tucana	Пд
Індзеец	Indus	Пд	Тэлескоп	Telescopium	Пд
Казярог	Capricornus	Пд	Фенікс	Phoenix	Пд
Карма	Puppis	Пд	Хамелеон	Chamaeleon	Пд
Касіопея (нар. назва Касцы)	Cassiopeia	Пн	Цыркуль	Circinus	Пд
Кіль	Carina	Пд	*Цэнтаўр*	Centaurus	Пд
Кіт	Cetus	Э	*Цэфей*	Cepheus	Пн
Компас	Pyxis	Пд	*Цялец*	Taurus	Пн
Крыж	Crux	Пд	Чаша	Crater	Пд
Лебедзь	Cygnus	Пн	*Шалі*	Libra	Пд
Леў	Leo	Пн	*Шчыт*	Scutum	Э
Ліра	Lyra	Пн	Эрыдан	Eridanus	Пд
Лісічка	Vulpecula	Пн	Яшчарка	Lacerta	Пн

Абазначэнні: Пн — паўн. паўшар'е неба, Пд — паўд. паўшар'е неба, Э — экватарыяльны пояс.

пылавой матэрыі, якая паглынае святло. З гэтай прычыны найбольш падрабязна даследавана толькі наваколле Сонца радыусам у некалькі кілапарсек. Зорная кінематыка вывучае рух Сонца адносна ансамбля аб'ектаў з аднолькавымі фізічнымі характарыстыкамі, заканамернасці размеркавання выпадковых скорасцей аб'ектаў адносна сяродніх рухаў ансамбля і закон вярчэння Галактыкі для розных тыпаў аб'ектаў. Зорная дынаміка разглядае ў тэарэт. аспекце агульныя ўласцівасці рухаў у зорнай сістэме, якія вызначаюцца сукупным дзеяннем узаемнага прыцягнення аб'ектаў. Паводле метадаў даследавання зорная дынаміка блізкая да тэарэт. фізікі і нябеснай механікі. Яна разглядае таксама эвалюц. змены зорных сістэм. У апошнія гады ў зорнай дынаміцы, асабліва пры рашэнні пытанняў эвалюцыі сістэм, выкарыстоўваюць хуткадзейныя ЭВМ.

Літ.: Паренаго П. П. Курс звездной астрономии, 3 изд., М., 1954; Агекян Т. А. Звезды, галактики, Метагалактика, 2 изд., М., 1970; Зонн В. и Рудницкий К. Звездная астрономия, пер. с польск., М., 1959.

А. С. Шароў. Масква.

ЗОРНАЯ ВЕЛІЧЫНЯ, мера бачнага бляску зорак, планет, туманнасцей і інш. нябесных свяцілаў.

Вызначана ў 2 ст. да н. э. такім чынам, што 15 самых яркіх зорак былі аднесены да 1-й З. в., а самыя слабыя, якія відаць простым вокам, да 6-й. Зоркі 2-й З. в. настолькі слабейшыя за зоркі 1-й З. в., наколькі зоркі 3-й З. в. слабейшыя за зоркі 2-й З. в. і г. д. (гэтае правіла адлюстроўвае псіхафізічную ўласцівасць зроку: святловае ўражанне вока прапарцыянальнае лагарыфму асветленасці, створанай святілам). Больш дакладныя вымярэнні паказалі, што Сірыус, Канопус, Вега, а таксама Месяц, Венера, Юпітэр і Марс ярчэйшыя за нулявую З. в. Таму былі прыняты адмоўныя З. в. Гл. табл. ў арт. *Зоркі*.

Бачны бляск святілаў ацэньваецца ў шырокім дыяпазоне ад −27-й (Сонца) да 24-й З. в. (найслабейшыя зоркі, даступныя самым моцным тэлескопам). Асветленасць ад святіла 1-й З. в. роўная 10^{-6} *лк*. Калі святілы аднесці ўмоўна на аднолькавую адлегласць у 10 *пс*, то атрымліваюцца т. зв. абсалютныя З. в., якія характарызуюць сапраўдную магутнасць выпрамянення святілаў. Найслабейшыя зоркі маюць 20-ю, найярчэйшыя пастаянныя зоркі −10-ю і звышновыя зоркі −20-ю абсалютную З. в. Абсалютныя З. в. галактык дасягаюць −23, а квазараў да −26.

Ю. П. Пскоўскі. Масква.

ЗО́РНЫ ДОЖДЖ, мноства, бязліч метэораў, якія падаюць у атмасферу, калі Зямля сустракаецца з *метэорным патокам*. З асабліва буйных З. д. (дзесяткі тысяч метэораў за 1 *гадз*) апошнія назіраліся ў 1933, 1946, 1966.

ЗО́РНЫЯ АСАЦЫЯЦЫІ, няўстойлівыя скопішчы зорак сумеснага паходжання, якія маюць некат. аднолькавыя фіз. адзнакі і сканцэнтраваны ў пэўных абласцях прасторы.

Паняцце З. а. ўвёў у 1947 В. А. *Амбарцумян*, які выявіў, што некат. гарачыя звышгігантскія зоркі высокай святільнасці ствараюць групу, дзе шчыльнасць размеркавання зорак у прасторы ў некалькі разоў большая, чым у агульным галактычным полі (О-асацыяцыі). Падобнае назіраецца ў прасторавым размеркаванні некат. зорак-карлікаў з нізкай святільнасцю, напр., пераменных зорак тыпу Т-Цяльца (Т-асацыяцыі). Прыклад О-асацыяцый — сістэма зорак класаў О і В у сузор'ях Арыёна, Лебедзя, Касіопеі. З. а. выяўлены і ў інш. галактыках (*Магеланавы Воблакі*, спіральная туманнасць *Андрамеды*). Вядома каля ста О-асацыяцый і трыццаці Т-асацыяцый. Даследаванні паказваюць, што зоркі З. а. паступова разыходзяцца ў прасторы, бо гравітацыйнае поле асацыяцыі меншае за сілы, якія дзейнічаюць на яе з боку *Галактыкі*. Гэта дае магчымасць, ведаючы стан З. а. у сучасную эпоху, ацаніць іх узрост. Ён складае ~ 10^6—10^7 гадоў, у 10^3 разоў меншы за ўзрост звычайных зорак. З. а.— вельмі маладыя ўтварэнні, а гэта сведчыць пра тое, што працэс фарміравання зорак у нашай Галактыцы ідзе далей. Вывучэнне З. а. спрыяла ўзнікненню зорнай *касмагоніі*.

Літ.: Агекян Т. А. Звезды, галактики, Метагалактика, 2 изд., М., 1970.

ЗО́РНЫЯ КА́РТЫ, адлюстраванні на плоскасці ўчасткаў зорнага неба ці цэлых паўшар'яў з дапамогай пэўнай картаграфічнай праекцыі, градуснай сеткі і адпаведнага маштабу.

Адрозніваюць рысаваныя і фатаграфічныя З. к. На рысаваных зоркі вычэрчваюцца па каардынатах, узятых з *зорных каталогаў*, абазначаюцца крыжочкамі розных дыяметраў у залежнасці ад бляску зоркі; падвойныя і пераменныя зоркі, зорныя скопішчы, туманнасці адзначаюцца спец. знакамі (гл. карту пры арт. *Зорнае неба*). Фатаграфічныя З. к. (больш падрабязныя) — адбіткі з астрафатаграфій з нанясеннем на іх градуснай сеткі. Камплекты З. к. наз. зорнымі атласамі. З. к. і атласамі карыстаюцца пры астр. назіраннях. Т. зв. рухомыя карты зорнага неба даюць магчымасць хутка вызначыць, якія сузор'і відаць над гарызонтам, для любой шыраты ў любы момант часу.

Літ.: Могилко А. Д. Учебный звездный атлас, 2 изд., М., 1964; Михайлов А. А. Звездный атлас, 4 изд., М.— Л., 1965. *М. П. Ерпылёў.* Масква.

ЗО́РНЫЯ КАТАЛО́ГІ, спісы зорак з указаннем іх нябесных каардынат, уласных рухаў, зорных велічынь і інш. параметраў. Бываюць аглядныя і спецыяльныя. У аглядных З. к. даюцца прыблізаныя звесткі пра вялікую колькасць зорак, па іх складаюцца *зорныя карты*. Спецыяльныя падзяляюцца на каталогі дакладных становішчаў зорак, уласных рухаў, паралаксаў, прамяневых скорасцей, спектральных класаў, падвойных зорак, пераменных зорак і інш. і выкарыстоўваюцца ў зорнай астраноміі. Для рашэння задач практычнай астраноміі, нябеснай механікі, геадэзіі служаць спец. каталогі дакладных зорных становішчаў (складаюцца на аснове астраметрычных назіранняў нябесных святілаў), фундаментальныя і зводныя каталогі (выводзяцца на аснове параўнання З. к., атрыманых на розных абсерваторыях у розны час). Зоркі ў З. к. размяшчаюцца звычайна ў парадку ўзрастання прамых узыходжанняў. Гл. таксама *Астраметрыя*.

Літ.: Мартынов Д. Я. Курс практической астрофизики, М., 1967; Подобед В. В. Фундаментальная астрометрия, 2 изд., М., 1968.

М. П. Ерпылёў. Масква.

ЗО́РНЫЯ СКО́ПІШЧЫ, групы зорак, якія звязаны паміж сабою сіламі ўзаемнага прыцягнення і маюць агульнае паходжанне. Некаторыя тыпы З. с. складаюцца з шчыльнага цэнтральнага згушчэння зорак і менш шчыльнай каранальнай вобласці.

Адрозніваюць шаравыя і рассеяныя З. с. Шаравыя (вядома каля 120) маюць выразную сферычную форму і змяшчаюць шмат тысяч зорак; дыяметры гэтых З. с. ад 10 да 100 *пс*. У *Галактыцы* шаравыя З. с. ствараюць сферычнае воблака і канцэнтруюцца каля ля ядра. Рассеяныя З. с. (вядома больш за 500) складаюцца з некалькіх дзесяткаў або сотняў зорак; іх дыяметры ад 3 да 15 *пс*. Яны размяшчаюцца ў плоскасці Галактыкі. Простым вокам можна бачыць толькі некалькі З. с.: з рассеяных — *Плеяды*, *Гіяды* (у сузор'і Цяльца), Яслі (у сузор'і *Рака*) і некаторыя інш., а з шаравых у выглядзе туманных плямаў — скопішчы ў *Геркулесе*, Тукане, *Цэнтаўры* і інш. Даследаванні залежнасці «спектр — святільнасць» (дыяграмы Герцшпрунга — Рэсела) для аб'ектаў, якія ўваходзяць у З. с., сведчаць пра тое, што зоркі шаравых З. с. у 100—1000 разоў старэйшыя за зоркі рассеяных З. с. Таму на размеркаванні ў прасторы і асаблівасцях руху шаравых З. с. можна зрабіць вывад пра асаблівасці размеркавання рэчыва ў Галактыцы на ранніх стадыях яе існавання (у эпоху ўзнікнення гэтых скопішчаў).

Літ.: Гл. пры арт. *Галактыка*.

М. П. Ерпылёў. Масква.

ЗО́РЫ, вёска ў Рэчыцкім с/с Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. Цэнтр калгаса «Бальшавік». За 8 *км* на ПнУ ад Чэрыкава, 130 *км* ад Магілёва, 23 *км* ад чыг. ст. Крычаў, каля шашы Чэрыкаў — Крычаў (1,5 *км*). 363 ж., двароў 136 (1971). Васьмігадовая школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін, дом адпачынку «Багданаўка». Помнік на магіле 2 сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну.

ЗО́РЫН (сапр. Табашнікаў) Мікалай Анфілохавіч [н. 12(25).12.1917, ст. Чарняўская Уральскай вобл.], беларускі савецкі артыст эстрады. Засл. арт. БССР (1967). Чл. КПСС з 1946. Скончыў тэатр. студыю Чэлябінскага драм. т-ра (1939). Працаваў у філармоніях Чэлябінска, Арла, Бранска. Выконваў праграмы: «Граф Нулін» А. Пушкіна, «Тамбоўская казначэіха» М. Лермантава, вершы С. Ясеніна, У. Маякоўскага (1942). З 1948 чытальнік Бел. філармоніі. Выконвае літ. кампазіцыі (з В. Спіткоўскай): «Маладая гвардыя» А. Фадзеева, «Бессмяротныя» М. Алігер, «Васіль Цёркін» А. Твардоўскага, «Вецер з Волгі» А. Вялюгіна, «Паэзія роднага краю» (па творах П. Броўкі, А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка) і інш.

«ЗО́РЬКА», штотыднёвая газета піянераў і школьнікаў Беларусі, орган ЦК ЛКСМБ і Рэсп. савета піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна. Выдаецца ў Мінску на рус. мове з 1.1.1945. Да № 11 1945 наз. «Пионер Белоруссии». Друкуе матэрыялы з жыцця школ, піянерскіх атрадаў і дружын, пра герояў працы і Айч. вайны, пра жыццё ў нашай краіне і за мяжой. Памагае наладжваць масавыя спарт. гульні, віктарыны, конкурсы і інш. Адзін раз у месяц друкуе на сваіх старонках пумар газеты для акцябрат «Огонек». Рэдактар А. Ф. Мазурава (1945—50 і з 1952).

ЗО́СІК Анатоль Ільіч (н. 15.11.1924, в. Горка Кобрынскага пав. Палескага ваяводства), кавалер ордэнаў Славы трох ступеняў. З сялян. Чл. КПСС з 1963. У Айч. вайну з сак. 1944 удзельнічаў у баях на Беларусі, у Польшчы, Германіі — старшы сяржант, камандзір стралк. аддзялення. Вызначыўся пры вызваленні в. Вулька Выбраніцкая (Польшча), у баях за вышыню Цэбельс на Шчэцінскім напрамку і ў баі за пас. пункт Забаў (Памеранія). Падняў аддзяленне ў атаку, закідаў варожую траншэю гранатамі і захапіў яе. Жыве ў Брэсце.

ЗО́ТАЎ Анатоль Васілевіч (н. 15.10.1925, Масква), наватар вытворчасці, лаўрэат Дзярж. прэміі СССР (1968). Чл. КПСС з 1953. Удзельнік Айч. вайны. Скончыў Бел. політэхн. ін-т (1960). У 1954—60 канструктар на Мінскім аўтазаводзе, з 1960 на Бел. аўтазаводзе, з 1965 нам. гал. канструктара з-да. Дзярж. прэмія СССР прысуджана за ўдзел у стварэнні уніфікаваных вялікагрузных аўтамабіляў для адкрытых распрацовак карысных выкапняў і буд-ва і ў асваенні іх серыйнай вытворчасці.

ЗО́ШЧАНКА Міхаіл Міхайлавіч [29.7(10.8). 1895, Палтава — 22.7.1958], рускі савецкі пісьменнік. Друкавацца пачаў у 1921. У сатыр. і гумарыст. апавяданнях, фельетонах высмейваў побыт мяшчан і абывацеляў («Апавяданні Назара Ільіча, пана Сінябрухава», 1922; «Шаноўныя грамадзяне», 1926; «Блакітная кніга», 1934—35; і інш.). Аўтар аповесцей «Мішэль Сінягін» (1930), «Чорны прынц» (1936), «Тарас Шаўчэнка» (1939), камедыі «Небяспечныя сувязі» (1940), цыкла твораў для дзяцей «Апавяданні пра Леніна» (1939—41). Узнаг. ордэнам Прац. Чырв. Сцяга.

Тв.: Избр. произв., т. 1—2, Л., 1968; бел. пер.— у час. «Полымя», 1969, № 4.

ЗРО́К, пачуццёвае адлюстраванне жывымі істотамі прадметаў навакольнага свету праз *зроку органы*. У ходзе гістар. развіцця жывёльных арганізмаў З. удасканальваўся. Некат. істоты (напр., дажджавыя чэрві) адрозніваюць толькі святло ад цемры; малюскі і кішачнаполасцевыя здольны вызначыць інтэнсіўнасць і напрамак пучка святла; насякомыя і ракападобныя ўспрымаюць велічыню і форму прадметаў. Чалавек з дапамогай З. адрознівае яркае і слабое святло, колер, рух прадметаў, іх размяшчэнне ў прасторы, можа разглядаць рэчы на рознай адлегласці, злучаць адлюстраванні кожнага вока ў адно (бінакулярны З., дае правільнае прасторавае ўспрыманне вобразаў навакольнага свету). Як орган адчування З. чалавека дае каля 80% інфармацыі пра навакольны свет.

На органы З. ўсе прадметы дзейнічаюць адбітымі або прамымі светлавымі прамянямі. Пад дзеяннем энергіі святла ў палачках (гл. *Зрокавы пурпур*) і колбачках сятчаткі *вока* адбываюцца фотахім. рэакцыі, узнікаюць эл. токі, якія выклікаюць нервовыя імпульсы. Апошнія перадаюцца па праводных шляхах зрокавага аналізатара да яго цэнтр. коркавага аддзела, дзе фарміруюцца зрокавыя адчуванні. З. характарызуецца вастрынёю. Вастрыня З., роўная 1,0 (нармальная), азначае здольнасць адрозніваць 2 кропкі прадмета з вуглом паміж імі ў 1'. У залежнасці ад інтэнсіўнасці асвятлення прадмета адчувальнасць вока мяняецца (адаптацыя вока). Пра парушэнні З. гл. арт. *Астыгматызм*, *Блізарукасць*, *Дальназоркасць*, *Дальтанізм*.

Літ.: Лазарев П. П. Соч., т. 2, М.— Л., 1950; Бабский Е. Б. и др. Физиология человека, М., 1966; гл. таксама літ. пры арт. *Вока*, *Зроку органы*.

М. П. Краўцоў. Мінск.

ЗРО́КАВЫ ПУРПУ́Р (радапсін), складанае бялковае святлоадчувальнае рэчыва чырвонага колеру (хромапратэід), якое ёсць у фотарэцэптарах сятчаткі вока (у палачках). Фотахімічныя ператварэнні З. п.— аснова змрокавага зроку. Зыходнае рэчыва для ўтварэння радапсіну — альдэгід вітаміну А і бялок.

Літ.: Гл. пры арт. *Зрок*.

ЗРО́КУ ОРГАНЫ, органы жывёльных арганізмаў, якія ўспрымаюць святловыя раздражненні. Ёсць ва ўсіх пазваночных і большасці беспазваночных (кішачнаполасцевых, чарвей, малюскаў, членістаногіх, ігласкурых і інш.). Асн. элемент З. о.— святлоадчувальныя клеткі (фотарэцэптары), размешчаныя пераважна ў галаўной частцы цела.

Найб. простыя З. о.— ізаляваныя святлоадчувальныя клеткі па ўсёй паверхні цела (напр., у дажджавога чарвяка), здольныя адрозніваць святло ад цемры. У п'явак зрокавыя клеткі аб'яднаны ў групы. У марской зоркі, слімака фотарэцэптары размешчаныя ў паглыбленнях скуры (ямках); яны здольныя вызначаць напрамак святла. Некат. кішачнаполасцевыя, кольчатыя чэрві маюць З. о. накшталт пухіра і адрозніваюць форму прадметаў. У многіх членістаногіх (ракападобныя, насякомыя) — фасетачныя вочы, якія складаюцца з вялікай колькасці асобных вочак; яны ўспрымаюць велічыню і форму прадметаў на блізкай адлегласці. Найб. дасканалыя З. о. ў чалавека (гл. *Вока*), у пазваночных і ў некат. беспазваночных (галаваногія малюскі). У чалавека і ў вышэйшых пазваночных жывёл зрокавы аналізатар складаецца з трох асн. аддзелаў: перыферычнага (вока), праводных (зрокавых і падкоркавых) шляхоў і цэнтр. аддзела (патылічнай долі кары вял. паўшар'яў галаўнога мозгу). Святлоадчувальная абалонка вока — сятчатка — мае рэцэптарныя клеткі: колбачкі

(знаходзяцца ў цэнтр. частцы) і палачкі (размешчаны на перыферыі сятчаткі, больш святлоадчувальныя). Пра функцыі З. о. гл. *Зрок*.


Літ.: Беклемишев В. Н. Основы сравнительной анатомии беспозвоночных, т. 1—2, 3 изд., М., 1964; Шмальгаузен И. И. Основы сравнительной анатомии позвоночных животных, 4 изд., М., 1947; Грегори Р. Л. Глаз и мозг, пер. с англ., М., 1970; гл. таксама літ. пры арт. *Вока* і *Зрок*.

А. А. Ільюшэнка. Мінск.

ЗРУБНАЯ КУЛЬТУРА, археал. культура бронзавага веку, пашыраная ў стэпах і лесастэпе Усх. Еўропы ў 2-й пал. 2-га — пач. 1-га тысячагоддзяў да н. э. Выдзелена В. А. Гарадцовым у 1901, назву атрымала ад пахавальнага абраду. Нябожчыкаў хавалі ў зрубах — ямах, абкладзеных дрэвам, скурчанымі на бок, побач клалі посуд, зброю, прылады працы. Плямёны З. к. сяліліся на берагах рэк, жылі ў зямлянках і паўзямлянках з двухсхільным дахам, займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам.

Літ.: Халиков А. Х. Поселения эпохи бронзы в Среднем Поволжье, «Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях Ин-та истории материальной культуры», 1953, в. 50.

ЗРУХ, від дэфармацыі, які характарызуецца скажэннем вуглоў элементарных паралелепіпедаў цела пры нязменным іх аб'ёме. Выклікаецца датычнымі напружаннямі τ; пры гэтым паралельныя грані зрушваюцца адна адносна другой.



Пры З. мае месца *Гука закон*: $\tau = G\gamma$, дзе G — модуль пругкасці, γ — адносны З. ці вугал З. (гл. рыс.). Гл. таксама *Дэфармацыя*.

ЗРУШЭННЕ (у геалогіі), разрыўное парушэнне зямной кары з адносным гарызантальным перамяшчэннем блокаў горных парод уздоўж шчыліны. Часта суправаджаецца вертыкальным ссоўваннем блокаў (скіда-зрушэнне ці ўскіда-зрушэнне). Пашыраны ў складкавых абласцях, трапляюцца ў межах Прыпяцкай упадзіны.

ЗРУШЭННІ МОЗГУ, траўматычнае пашкоджанне мазгавога рэчыва без грубых дэструктыўных змен. Суправаджаецца рэфлекторным расшырэннем дробных крывяносных сасудаў з пастачай жыўлення галаўнога мозгу і парушэннем яго функцый.


Адрозніваюць тры формы З. м.: лёгкую, сярэднюю і цяжкую. Прыметы: непрытомнасць, моташнасць, ірвота, боль галавы, расстройствы памяці — рэтраградная амнезія (чалавек не памятае пра траўму і тое, што было перад ёй). Сімптомы З. м. знікаюць хутка. Цяжкая форма З. м. можа пакінуць т. зв. камацыйны неўроз (боль галавы, агульная слабасць, хуткая стамляльнасць, зніжэнне памяці і працаздольнасці). Лячэнне: спакой (пасцельны рэжым не менш як 10 дзён), седатыўныя, сардэчныя, дэгідратавальныя, агульнаўмацавальныя сродкі, шыйная вага-сімпатычная ці паясніч-ная новакаінавая блакада і інш.

Літ.: Шарапов В. И. Изменения в головном и спинном мозге при закрытой травме черепа, Кишинев, 1962; Многотомное руководство по неврологии, т. 8, М., 1962.

І. П. Антонаў. Мінск.

ЗУБ Валянцін Андрэевіч [н. 27.12.1914(9.1. 1915), Мінск], беларускі савецкі пісьменнік. З рабочых. Скончыў Усесаюзны ін-т кінематаграфіі (1943). Удзельнік Айч. вайны. Працаваў на сцэнарнай студыі К-та па справах кінематаграфіі СССР у Маскве (1943—44), на кінастудыі «Беларусьфільм» (1944—46). З 1946 у час. «Вожык». Друкуецца з 1938. Аўтар аповесці для дзяцей «Таямнічы падпіс» (1953), аб. апавяд. «Сапернікі» (1958), «Пад вясновым сонцам» (1960), «Як Толік праславіўся» (1962), аб. п'ес «Злавацца не трэба» (1961, аднайм. п'еса паст. ў т-ры імя Я. Купалы, 1960) і інш. Т-р юнага гледача паставіў п'есы З. «Сябры» (1958, напісаў з Ю. Багушэвічам), «Марат Казей» (1962), «Юнацтва рыцара» (1970).

ЗУБАПРАЦОЎЧЫЯ СТАНКІ, прызначаны для нарэзання і аддзелкі элементаў счаплення зубчастых колаў.



Для нарэзання зубцоў выкарыстоўваюцца зубафрэзерныя, зубастругальныя і зубадаўбёжныя, для аддзелкі — зубааддзелачныя (шэвінгавальныя) і зубапрыцірачныя станкі. Прамежкавае становішча займаюць зубапрацяжныя і зубашліфавальныя станкі, на якіх нарэзанне спалучаецца з чыставой аддзелкай. На З. с. апрацоўваюць цыліндрычныя зубчастыя і чарвячныя колы з модулем счаплення ад 0,05 да 75 *мм* і дыяметрам да 9000 *мм*, канічныя зубчастыя колы з модулем ад 0,3 да 50 *мм* і дыяметрам да 8000 *мм*. З. с.— высокапрадукцыйныя, дакладныя паўаўтаматы ці аўтаматы.

На Беларусі З. с. вырабляе *Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Камінтэрна*, прадукцыя якога экспартуецца ў многія краіны свету. Асноўныя віды З. с. з-да: зубафрэзерныя (мадэлі 5А312, 5К310); зубашэвінгавальныя (мадэлі 5701; 5702, гл. рыс.; 5А703); зубахапінгавальныя (мадэлі 5913, 5915); зубазакругляльныя (мадэлі 5Н582, 5Д582); зубафаскавыя (мадэлі 5525, 5527).

Літ.: Березин В. П., Думченко И. И. и Мосолов К. В. Зубошлифовальные работы, М., 1966; Пинкус М. Ю. Нарезание зубчатых колес, Мн., 1957; Лоскутов В. В. Зуборезные станки, 2 изд., М., 1967.

ЗУБАВА, вёска ў Аршанскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Янкі Купалы. За 17 *км* на Пд ад Оршы, 99 *км* ад Віцебска, 12 *км* ад чыг. ст. Копысь, каля шашы Орша — Магілёў (1,5 *км*). 425 ж., гасп. 169 (1971). Васьмігадовая школа, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, магазін. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Айч. вайну. Бюст на магіле Героя Сав. Саюза К. Я. *Анохіна*.

ЗУБАР (Зубр), рака, левы прыток Беседзі (бас. Дняпра). Даўж. 23 *км*. Цячэ ў Касцюковіцкім р-не Магілёўскай вобл. Вадазбор (206 *км*²) у межах паўд.-зах. ускраіны Аршанска-Магілёўскай раўніны. Рэльеф дробнапагорысты, у ніжняй ч. аблесены і забалочаны. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 0,9 *м*³/*сек*.

ЗУБАРАВА Таццяна Сямёнаўна [н. 24.12. 1916(6.1.1917), в. Мікалаеўка 2-я Магілёўскага пав.], перадавік с.-г. вытворчасці, Герой Сац. Працы (1958). Прац. дзейнасць пачала ў 1933 даяркай у калгасе «Шлях да сацыялізма» Магілёўскага р-на, з 1950 даярка калгаса «Камінтэрн» гэтага р-на.

ЗУБАТАЎШЧЫНА, адзін з метадаў барацьбы царскага ўрада супраць рабочага руху ў Расіі ў 1901—03 пры дапамозе легальных рабочых арг-цый, якія ствараліся пад наглядам паліцыі, каб раскалоць рабочы рух, адцягнуць яго з-пад уплыву рэвалюц. сацыял-дэмакратыі і накіраваць на шлях эканам. барацьбы. Атрымаў назву ад прозвішча нач. маскоўскай аховы С. В. Зубатава.


Першая зубатаўская арг-цыя створана ў Маскве у маі 1901. Былі ў Кіеве, Харкаве, Пецярбургу. Летам 1901 у Мінску, Вільні і Адэсе група сіяністаў і б. бундаўцаў стварыла зубатаўскую «Яўрэйскую незалежную рабочую партыю». Правакацыйную сутнасць З. выкрывалі ленінская «Искра» і яе к-ты ў Расіі. Ва ўмовах уздыму рэвалюц. руху ў 1903 урад ліквідаваў зубатаўскія арг-цыі. Рэцыдывам З. была арг-цыя «Сход рускіх фабрычна-заводскіх рабочых С.-Пецярбурга» пад кіраўніцтвам Гапона, якая ўваходзіла ў падзелы *Дзевятага студзеня 1905*.

Літ.: Ленін У. І. Што рабіць?, Тв., т. 5 (Поли. собр. соч., т. 6); Ягож. Палітычная барацьба і палітыканства, Тв., т. 6 (там жа, т. 7); Віч М. Крах апартуністычнай тактыкі эканамізму, «Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук», 1969, № 2.

Ю. І. Афонін. Мінск.

ЗУБАТЫЯ КІТЫ (Odontoceti), падатрад водных млекакормячых атр. кітападобных. Каля 80 відаў, аб'яднаных у 4 сямействы: рачныя дэльфіны, дзюбатыя дэльфіны, кашалотавыя і дэльфінавыя. Жывуць ва ўсіх морах і акіянах.

Даўж. цела З. к. 1—19 *м*, маса ад 80 *кг* да 100 *т*. Цела верацёнападобнае, галава вялікая, шыйнага перахвату няма або выяўлены слаба. Насавая адтуліна (дыхала) адна, размешчана на цемені (у кашалота на канцы рыла). Ад 1 да 250 аднакарэнных зубоў. Пярэднія канечнасці маюць выгляд плаўнікоў, задніх няма (толькі рудыменты шкілета). Адзін плаўнік на спіне. Цела канчаецца гарызантальным плаўніком. Жывяцца рыбаю, малюскамі, ракападобнымі. Полавай спеласці дасягаюць у 2—3 гады. Кожны год або праз год нараджаюць 1 вялікае (да паловы даўж. самкі) дзіцяня і 4—6 месяцаў кормяць яго малаком. У водах СССР жывуць прадстаўнікі 3 сям. (рачных дэльфінаў няма), 30 відаў (кашалот, бутэльканос, бялуха, аднарог, марская свіння, касатка, грында, шэры дэльфін, афаліна, белабочка і інш.). Некат. З. к.— важны аб'ект промыслу (выкарыстоўваюць тлушч, мяса, амбру, спермацэт, скуру). Гл. таксама *Дэльфінавыя*.



Касатка.

Літ.: Томилин А. Г. Китообразные фауны морей СССР, М., 1962; Ягож. Китообразные, М., 1957 (Звери СССР и прилежащих стран, т. 9); Млекопитающие фауны СССР, ч. 2, М.— Л., 1963.

ЗУБАЎ Рыгор Мікітавіч [25.12.1910(7.1.1911), с. Костылева Чалябінскага пав. Аранбургскай губ.— 3.7.1944], удзельнік баёў на Беларусі ў Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1944). На фронце з 1941. Вызначыўся на тэр. Мінскага р-на. 3.7.1944 старшы сяржант З. каля в. Пільніца сваім танкам, ахопленым полымем, тараніў варожы танк. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны на цэнтр. сядзібе саўгаса «Бальшавік» Мінскага р-на. На магіле героя помнік.

ЗУБАЧОЎ Іван Мікалаевіч [15(27).2.1898, в. Падлесная Слабада Зарайскага пав. Разанскай губ.— 1944], адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1918. У Чырв. Арміі з 1932. Удзельнік грамадз., сав.-фінляндскай вайны 1939—40. Нам. камандзіра 44-га стралк. палка, капітан З. узначаліў зводную групу абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Цяжка паранены трапіў у палон, загінуў у лагеры ваеннапалонных. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны 1-й ступені. Яго імем названа вуліца ў Брэсце.



Літ.: Героическая оборона. Сборник воспоминаний об обороне Брестской крепости в июне — июле 1941 г., 3 изд., Мн., 1966; Смирнов С. С. Герои Брестской крепости, М., 1961; Ягож. Брэсцкая крэпасць, Мн., 1967.


ЗУБКІ, вёска ў Клецкім р-не Мінскай вобл., на р. Цапра. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Зубкі». За 10 *км* на У ад Клецка, 150 *км* ад Мінска, 7 *км* ад чыг. ст. Клецк. 463 ж., дваро́ў 153 (1971). Камбінат быт. абслугоўвання. Васьмігадовая школа, Дом культуры, б-ка, дзіцячыя яслі-сад, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі, сталовая, магазін.

ЗУБКІ, вёска ў Лёзненскім р-не Віцебскай вобл., на р. Мошна. Цэнтр сельсавета і саўгаса імя Чкалава. За 0,5 *км* на ПдЗ ад Лёзна, 40 *км* ад Віцебска. 348 ж., гасп. 136 (1971). Клуб, б-ка, вет. пункт, аддз. сувязі. Ням.-фаш. захопнікі загубілі 14 мірных жыхароў вёскі.

ЗУБКОВА Антаніна Лявонцьеўна (12.10. 1920, с. Сімяон Разанскага пав.— 13.11.1950), удзельніца баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1945). Чл. КПСС з 1944. На фронце з 1943, штурман эскадрыллі бамбардзіровачнага авіяпалка. У Беларускай аперацыі ўдзельнічала ў баях за Віцебск, Оршу, Багушэўск, Дуброўна, Барысаў. Зрабіла 66 баявых вылетаў.

ЗУБНІК (Cirsium), род адна-, двух- і шматгадовых травяністых раслін сям. складанакветных. Вядома больш за 200 відаў, пашыраных у Еўропе, Азіі, Афрыцы і Паўн. Амерыцы. У СССР 54 віды, на Беларусі 6.

Сцябло выш. да 1 *м*. Прыкаранёвае лісце цэласнае, у разетцы, сцябловае — надрэзанае або перыстараздзельнае. Кветкі жоўтыя, сабраныя ў кошыкі. Плод — сямянка з чубком. На Беларусі найб. вядомы — З. дахавы (C. tectorum,



Зубнік дахавы: *1* — агульны выгляд; *2* — кветка.

нар. назвы: курынае слепата, паллвая цыкорыл). Расце на палях, лугах, у хмызняках, лясах, на балотах. Лекавая расліна.

Літ.: Флора БССР, т. 5, Мн., 1959.

ЗУБНІЦА (Dentaria), род шматгадовых травяністых раслін сям. крыжакветных. Вядома 16 відаў, пашыраных у Еўропе, Паўн. Амерыцы, Паўн. і Цэнтр. Азіі. У СССР 8 відаў, на Беларусі адзін — З. клубняносная (D. bulbifera), характэрны вясновы эфемер.



Зубніца клубняносная: *1* — агульны выгляд; *2* — цыбулька.

Сцябло прамастойнае выш. да 60 *см*. Карэнішча цыліндрычнае, лускаватае, з цыбулькамі. Лісце трайчастае або перыстарассечанае. Кветкі ліловата-ружовыя, сабраныя ў гронкі. Плод — стручок. Трапляецца ў зоне шыракалістых лясоў. Цвіце ў маі — чэрв. Жывародная расліна. Карэнішча мае вяжучыя рэчывы. Ахоўваецца як рэдкая расліна.

Літ.: Флора БССР, т. 2, Мн., 1949.

ЗУБО́ВІЧ Дзмітрый Дзмітрыевіч [н. 16(29). 10.1909, в. Бялевічы Слуцкага пав. Мінскай губ.], генерал-лейтэнант



(1967). З сям'і парабка. Чл. КПСС з 1938. Скончыў Ваен.-гасп. акадэмію (1941), Ваен. акадэмію Ген. штаба (1948). У Чырв. Арміі з 1931. У Айч. вайну на Карэльскім фронце — пам. і пам. нач. аддзела ў штабе тылу фронту, нам. камандзіра дывізіі і корпуса па тыле. У 1949—68 нач. штаба тылу і нач. тылу ваен. акругі. З кастр. 1968 у адстаўцы. Узнаг. ордэнам Леніна, 3 інш. ордэнамі. Жыве ў Свярдлоўску.

ЗУБО́ВІЧ Канстанцін Міхайлавіч (1904, в. Папоўцы Вілейскага пав. Віленскай губ.— 28.12. 1944), Герой Сав. Саюза (1945). З сялян. У Айч. вайну на фронце з ліст. 1944. Вызначыўся ў баях за вызваленне Венгрыі. 5.12.1944 фарсіраваў Дунай, знішчыў гранатамі кулямётны разлік ворага, дапамог сав. воінам захапіць плацдарм і адбіць 5 контратак. Загінуў у баі. Пахаваны ў Будапешце.



ЗУБО́Ў І РО́ТАВАЙ ПО́ЛАСЦІ ХВАРО́БЫ, хваробы, анамаліі, пашкоджанні цвёрдых і мяккіх абалонак зубоў, сківіц, слінных залозаў, слізістай абалонкі рота, губ, языка.

Падзяляюцца на спадчынныя (анамаліі) і набытыя (траўмы, хваробы). Анамаліі зубоў: звышкамплектныя зубы (супрадэнцыя), адсутнасць (адэнцыя), няправільнае размяшчэнне, незвычайныя памеры і колер. Адсутнасць зубоў адрозніваюць ад затрымкі прарэзвання іх — ратэнцыі. Найб. пашыраны *карыес зубоў*. Радзей — гіпаплазія (недаразвіццё) і павышанае змульванне эмалі і дэнціну ад хвароб арганізма з парушэннем мінер. і бялковага абмену рэчываў (гемалітычная хвароба нованароджаных, спазмафілія, хранічная дызентэрыя). У мясцовасцях, дзе ў пітной вадзе шмат фтору, можа быць флюароз з пігментацыяй і дэфектамі эмалі. Пашкоджанні зубоў бываюць механічныя (прафесійныя — у краўцоў, шкловыдзімальшчыкаў, шаўцоў), ад агністрэльных раненняў з пераломамі каранёў, каронак і кроваліццём у пульпу. Ускладненні хвароб зубоў: лімфадэніты, перыастыты, астэаміэліты сківіц, флегмоны твару і шыі, гаймарыты. Лячэнне хворых на рэўматызм, септычны эндакардыт пасля выдалення гнойных ачагоў у зубах дае лепшыя вынікі. Лячэнне хворых зубоў хірургічнае і артапедычнае. З хвароб ротавай поласці найчасцей бывае *стаматыт*, радзей пашкоджанні слізістай абалонкі грыбкамі (аспергілёз, гістаплазмоз, споратрыхоз, актынамікоз, бластамікоз, кандыдамікоз) і перадракавыя хваробы (лейкаплакія, гіперкератоз, папілома) (гл. *Пухлі́ны*). Да лейкаплакій належаць і лейкакератоз паднябення. Бывае ў людзей, якія злоўжываюць курэннем. Пухліны ротавай поласці падзяляюць на дабраякасныя (фібраміёмы, ліпомы, папіломы, неўрыномы, лейміёмы, адэномы, адэналімфомы) і злаякасныя (рак, саркома). Лячэнне пухлін хірургічнае, прамянёвае і камбінаванае. 50% людзей хварэюць на *парадантоз* — дыстрафічны працэс альвеалярных адростка ў сківіц. Прафілактыка: рацыянальнае з дастатковай колькасцю вітамінаў харчаванне, правільны догляд зубоў, планавая дыспансерызацыя і санацыя зубоў у дзяцей у школах і дзіцячых садах, у цяжарных жанчын, дапрызыўнікоў, рабочых прамысл. прадпрыемстваў.


Літ.: Бусыгина М. В. Болезни зубов и слизистой оболочки полости рта, М., 1967; Евдокимов А. И. и Васильев Г. А. Хирургическая стоматология, М., 1964; Пародонтоз, М., 1967 (бібліягр.); Мятліцкі Ю. К. і Перкаль К. І. Хваробы зубоў, поласці рота і іх папяражанне, Мн., 1958. *К. І. Бердыган.* Мінск.

ЗУБР (Bison bonasus), жвачная жывёла сям. пустарогіх атр. парнакапытных. Вядома 2 падвіды З.: раўнінны еўрапейскі (белавежскі) і горны каўказскі, а таксама помесі паміж імі. Белавежскі З. жыве ў прыродных умовах у *Белавежскай пушчы* і гадуецца ў спец. гаспадарках (Прыокска-Тэрасным запаведніку, Пашыляйскім лесе). Помесі паміж белавежскім і каўказскім З. расселены ў інш. гадавальніках СССР (на Беларусі ў *Бярэзінскім дзяржаўным запаведніку*). У пач. 70-х г. 20 ст. ва ўсім свеце З. было больш за 1000.

З.— адзін з найбольшых прадстаўнікоў сучаснай фаўны СССР, самы вялікі звер беларускай фаўны. Даўж. да 3,5 *м*, выш. ў карку да 2 *м*, маса да 1000 *кг*. Пярэднял частка тулава масіўная за кошт гарба, утворанага асцістымі адросткамі шыйных і спінных пазванкоў. Галава вялікая. Шыя кароткая і тоўстая. Грудзі шырокія, магутныя. Масць бурая. Валасное покрыва нераўнамернае: на лобе, карку, ніжняй і верхняй частцы шыі, падбародку поўсць доўгая (утварае грыву, бараду, махры падгрудка). З.— стадная жывёла. У статку калі 20 асобін (у 1906 трапляліся статкі па 40—60 галоў). На чале яго самка. Цяжарнасць у З. калі 9 месяцаў, прыплод — пераважна адно цяля. Летам корміцца травяністай і дрэўнай раслінасцю, зімою (калі няма падкормкі) парасткамі, карою дрэў і кустоў, чарнічнікам, верасам. Жыве 35—50 гадоў. Цікавы як рэлікт стараж. фаўны. Перспектыўны пры гібрыдызацыі з буйн. раг. жывёлай. Дае калі 500 *кг* мяса, шэрсць і вельмі моцную скуру. Гл. ілюстр. да арт. *Белавежская пушча*.

Літ.: Корочкина Л. Н. Беловежский зубр, у кн.: Труды заповедно-охотничьего хозяйства «Беловежская пуща», в. 1, Мн., 1958; Сержанин И. Н. Млекопитающие Белоруссии, 2 изд., Мн., 1961 (бібліягр.). *Л. М. Корачкіна.* Брэст.


«ЗУБРЁНЯ», рэспубліканскі піянерскі лагер. Засн. ў жн. 1969 на беразе воз. Нарач (Мядзельскі р-н Мінскай вобл.). Працуе круглы год. У лагеры адначасова адзін месяц піянеры-актывісты, дзіцячыя калектывы маст.



Піянерскі лагер «Зубрёня».

самадзейнасці. Дзеці, якія адпачываюць у час навуч. г., займаюцца ў школе (5—8 кл.). Праводзяцца зборы, турысцкія паходы, традыц. дзень памяці нарачанскіх партызан, конкурсы інсцэніраванай песні, сустрэчы са знатнымі людзьмі; працуе школа піянерскага актыву. У 1970 у лагеры адпачыла каля 5000 дзяцей.

ЗУБРО́ЎКА (Hierochloë), род шматгадовых травяністых раслін сям. злакавых. Вядома 15 відаў, пашыраных ва ўмераным і халодным паясах зямнога шара. У СССР 8 відаў, на Беларусі два — З. паўднёвая (H. australis) і З. духмяная (H. odorata, нар. назвы: зубрава трава, цяпалоць).



Зуброўка духмяная: *1* — агульны выгляд расліны; *2* — каласок.

Сцяблы гладкія або баразнаватыя, выш. да 70 *см*. Карэнішча паўзучае. Суквецце — пірамідальная мяцёлка. Каласкі бліскучыя, залацістыя. Расце З. на лугах і ў лясах. Духмяная трава, змяшчае кумарын. Выкарыстоўваецца для араматызацыі напіткаў, прыгатавання настоек. З. паўднёвая — любімы корм зуброў у Белавежскай пушчы.

Літ.: Флора БССР, т. 1, М., 1949.

ЗУБРО́ЎНІК, род раслін, тое, што *бекманія*.

ЗУБРЫ, чыг. ст. на лініі Орша — Крычаў, вёска ў Саўскім с/с Горацкага р-на Магілёўскай вобл. За 17 *км* на ПнЗ ад Горак, 112 *км* ад Магілёва. 340 ж., дваро́ў 155 (1971). Лясніцтва. Васьмігадовая школа, фельч.-ак. пункт, аддз. сувязі.

ЗУБРЫЦКІ Іван Васілевіч [н. 5(17).2.1898, Рэчыца — 25.11.1963], беларускі савецкі геадэзіст. Праф. (1960). Чл. КПСС з 1943. Скончыў Беларускую с.-г. акадэмію (1929). З 1930 дацэнт кафедры геадэзіі БСГА, у 1942—47 працаваў у Новасібірскім ін-це інжынераў геадэзіі, у 1947—63 заг. кафедры геадэзіі БСГА. Распрацаваў і тэарэтычна абгрунтаваў метад чатырохвугольнікаў без дыяганаляў для стварэння геадэзічных сетак, які выкарыстоўваецца пры землеўпарадкаванні і планіроўцы гарадоў.

Тв.: Метод четырехугольников без диагоналей в геодезии и его точность, у кн.: Уравновешивание и оценка точности сетей геодезического съемочного обоснования, Мн., 1965.

С. І. Памялоў. Горкі, Магілёўская вобл.

ЗУБРЫ́Ч Дзмітрый Іванавіч (1.6.1922, в. Дзергачы Харкаўскага пав.— 1.10.1968), беларускі савецкі спявак (барытон). Засл. арт. БССР (1967). Чл. КПСС з 1964. У 1952 скончыў Харкаўскую кансерваторыю, з 1954 саліст Бел. філармоніі. Меў разнастайны канцэртны рэпертуар (больш за 400 твораў), у якім значнае месца належала бел. нар. песням, арыям з опер, рамансам і песням бел. кампазітараў.

ЗУБРО́ВІЧЫ, вёска ў Дубраўскім с/с Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Цэнтр калгаса «Хваля рэвалюцыі». За 19 *км* на ПдЗ ад Оршы, 101 *км* ад Віцебска, 10 *км* ад чыг. ст. Копысь. 240 ж., дваро́ў 91 (1971). Сярэдняя школа, клуб, вет. пункт, магазін.


ЗУБРО́ВІЧЫ, вёска ў Дзяржынскім р-не Мінскай вобл., на р. Ператуць. Падпарадкоўваецца Негарэльскаму гарпасялковаму Савету. Цэнтр калгаса «Расія». За 20 *км* на Пд ад Дзяржынска, 58 *км* ад Мінска, 11 *км* ад чыг. ст. Негарэлае. 76 ж., гасп. 23 (1971). Пач. школа, клуб, б-ка, фельч.-ак. пункт, магазін. У 1944 ням.-фаш. захопнікі часткова спалілі вёску, загубілі 15 мірных жыхароў.

ЗУБЧА́СТАЕ КО́ЛА, асн. дэталь зубчастых перадач, адна з паверхняў якой прафілявана зубцамі. Зубчастым счапленнем (эвальвентным, кругавым, цыклаідальным і інш.) кола перадае рух спалучанай дэталі.

Асн. віды З. к.— цыліндрычныя, канічныя, чарвячныя. Літ. і іл. гл. пры арт. *Зубчастая перадача*.

ЗУБЧА́СТАЯ ПЕРАДА́ЧА, механізм перадачы руху з дапамогаю *зубчастых колаў*. Выкарыстоўваецца звычайна для перадачы вярчэння ад аднаго вала да другога з зададзенай суадносінай вуглавых скорасцей (перадатачным лікам).

Адрозніваюць З. п. (гл. рыс.): з паралельнымі восямі — цыліндрычныя прамазубыя (*а*, *г*), касазубыя (*б*) і шаўронныя (*в*); з перасякальнымі восямі — канічныя з прамымі (*д*), касымі і кругавымі (*е*) зубцамі; з перакрыжаванымі восямі — вінтавыя (*ж*) і гіпоідныя; перадача шасцярня — рэйка (*з*). Да З. п. належаць таксама кругавінтавая перадача сістэмы М. Л. Новікава і хвалевая пера-



дача. З. п. бываюць унутранага і вонкавага счаплення; планетарныя і радавыя; адкрытыя, паўадкрытыя і закрытыя; адна- і шматступеньчатыя. Перадатачны лік звычайна 2—4, у асобных выпадках 8—10. Гл. таксама *Чарвячная перадача.*

Літ.: Часовников Л. Д. Передачи зацеплением, 2 изд., М., 1969; Кудрявцев В. Н. Упрощенные расчеты зубчатых передач, 4 изд., Л., 1967.

Ф. Ф. Азёмша. Мінск.

ЗУБЫ, косцепадобныя органы большасці пазваночных жывёл і чалавека ў ротавай поласці на альвеалярных адростках верхняй і ніжняй сківіцы (у некат. рыб у глотцы). Асн. функцыя: захопліванне, трыманне і пераможванне яды (у некат. жывёл З. служаць аховаю ад ворагаў). Няма зубоў у сучасных птушак і ў чарапах, у дарослых асятровых рыб, непаўназубых млекакормячых (пангаміі і мурашкаеда). У аднапраходных і бязззубых кітоў З. ёсць толькі на стадыі зародка.



Зубы чалавека: *1* і *2* — разцы; *3* — ікол; *4* і *5* малыя карэнныя; *6* — *8* — вялікія карэнныя.

З. ўтвараюцца з эпітэліяльнай і злучальнай тканак. Складаюцца з відазмененай косці (эмалі, дэнціну, цэменту). Маюць каронку (выступае над сківіцаю, укрыта эмаллю), корань (размешчаны ў сківіцы, укрыты цэментам), злучальную частку — шыйку. Унутры З. ёсць поласць, запоўненая зубной мякаццю (пульпаю), у якой праходзяць крывяносныя сасуды і нервы. У залежнасці ад формы каронкі і прызначэння адрозніваюць разцы, іклы, карэнныя З., ад колькасці каранёў — адна-, двух-, трохкарэнныя. Колькасць З. у драпежных жывёл да 44, у некат. сумчатых — да 58, у дэльфінавых — 240. Большасць млекакормячых мае ў кожнай сківіцы 3—5 пар разцоў (чалавек — 2 пары), 1 пару іклаў, да 8 пар карэнных (чалавек — 2 пары малых і 3 пары вялікіх карэнных). Амаль ва ўсіх пазваночных (акрамя млекакормячых) З. зменьваюцца ўсё жыццё, у большасці млекакормячых — 1 раз (у маладым узросце); у непаўназубых і кітападобных З. не зменьваюцца. У чалавека 2 змены З.: малочныя (20) і сталыя (32). Малочныя прарэзваюцца з 6 да 30 месяцаў, сталыя — з 6 да 16 гадоў, З. мудрасці — да 30 гадоў. З. забяспечваюцца крывёю верхне- і ніжнесківічнымі артэрыямі, інервуюцца трайнічным нервам. Гл. таксама *Зубоў і ротавай поласці хваробы.*

Літ.: Фалин Л. И. Гистология и эмбриология полости рта и зубов, М., 1963; Привес М. Г., Лысенков Н. К. и Бушкович В. И. Анатомия человека, 7 изд., Л., 1969.

ЗУЁВІЧ Іван Цімафеевіч [н. 8(21).5.1904, в. Карпавічы Віцебскага пав.], адзін з кіраўнікоў партыз. руху ў Гомельскай вобл. ў Айч. вайну. З сялян. Чл. КПСС з 1927. Скончыў Камуніст. ун-т імя Леніна ў Мінску (1932). З 1932 рэдактар ельскай, жлобінскай раённых газет, на сав. і парт. рабоце. У партызанах з жн. 1941: сакратар Рагачоўскага падпольнага РК КП(б)Б, адначасова камісар атрада, з мая 1944 камісар *партызанскай брыгады 8-й Рагачоўскай* Гомельскай вобл. У 1944—63 на парт. і сав. рабоце ў Жлобіне, Пінску, Століне, Мінску. Узнаг. ордэнам Леніна, 2 інш. ордэнамі, медалямі. Жыве ў Мінску.

ЗУЁЎ Аляксей Міхайлавіч (жн. 1922, в. Фёдараўскае Вяземскага пав. Смаленскай губ.— 6.11.1952), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1944). Чл. КПСС з 1942. У Чырв. Арміі з 1941, камсорг стралковага батальёна. Вызначыўся на тэр. Сіроцінскага р-на Віцебскай вобласці. 26.6.1944 у час прарыву абароны каля г. п. Обаль З. першы падняўся ў атаку, уварваўся ў варожыя траншэі, знішчыў кулямётны разлік праціўніка.

ЗУЁЎ Іван Дзмітрыевіч (1912, в. Вілякіна Вялікалуцкага пав. Пскоўскай губ.— 17.10. 1943), удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1940. У Чырв. Арміі з 1937. На фронце з 1941, маёр, нач. артылерыі стралк. палка. Вызначыўся ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. 16.10.1943 падраздзяленні на чале з З. фарсіравалі Дняпро, садзейнічалі прарыву абароны ворага і замацаванню на плацдарме. Загінуў у баі.

ЗУЁЎ Іван Фадзеевіч [н. 24.1(6.2).1908, в. Лядцо Ельнінскага пав. Смаленскай губ.], удзельнік баёў на Беларусі ў Айч. вайну. Герой Сав. Саюза (1943). Чл. КПСС з 1943. На фронце з 1941. Вызначыўся ў Гомельскай вобл. ў кастр. 1943. Група сапёраў на чале з З. пабудавала 7 плытоў, на якіх байцы фарсіравалі Дняпро, захапілі плацдарм і ўдзельнічалі ў вызваленні в. Шытцы на Пд ад Лоева. Жыве ў Ельні.

ЗУЁНАК Васіль Васілевіч (н. 3.6.1935, в. Мачулішча Халопеніцкага р-на), беларускі савецкі паэт. Чл. КПСС з 1966. З сялян. Скончыў адда. журналістыкі БДУ (1959). Працаваў у рэдакцыях газ. «Рабочае юнацтва» (1959—60), «Піянер Беларусі» (1960—66). З 1966 нам. гал. рэдактара час. «Маладосць». Друкуецца з 1954. Аўтар зб. вершаў «Крэсіва» (1966), «Крутаяр» (1969). Асноўнае ў паэзіі З.— матывы маральнай чысціні чалавека, роздум над сучасным жыццём. Піша таксама для дзяцей (зб. вершаў «Вясёлы калаўрот», 1965; «Жылібыллі пад вадой», 1969; зб. нарысаў і замалёвак «Любіць прыроду — любіць Радзіму», 1962; «Працай славіцца чалавек», 1963).

Літ.: Караткевіч У. Крэсіва. Іскры. Агонь, «Маладосць», 1966, № 8; Шпаковский Я. Первородство, «Дружба народов», 1970, № 8.

ЗУПКА, рака, левы прыток р. Сэрвач (бас. Нёмана). Даўж. 28 *км.* Цячэ ў Докшыцкім р-не Віцебскай і Мядзельскім р-не Мінскай абл. Вадазбор (142 *км²*) на паўн.-зах. схілах Мінскага ўзв., забалочаны і парэзаны асушальнымі канавамі ў ніжняй частцы. Жыўленне мяшанае, пераважна снегавое. Сярэдні гадавы расход вады ў вусці каля 1 *м³/сек.*

СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ НА АСОБНЫХ АРКУШАХ

Графіка — 23 ілюстрацыі на трох старонках (глыбокі друк) . . . . . 8—9
Гродзенская вобласць — 7 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 24—25
Гродзенскі хімічны камбінат імя С. В. Прытыцкага — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 8—9
Гродна — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) . 24—25
Грубэ А. В.— 1 ілюстрацыя (глыбокі друк) . . . . . 32—33
Грузінская ССР — 15 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . 40—41
Груша — 4 ілюстрацыі (афсет) . . . . 46—47
Грыбы — 31 ілюстрацыя на трох старонках (афсет) . . . . . 48—49
Грызуны — 19 ілюстрацый (афсет) . . 48—49
Грэцыя Старажытная — 14 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . 64—65
Данія — 8 ілюстрацый (глыбокі друк) . 144—145
Дашкольнае выхаванне — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 32—33
Дзіцячая творчасць — 10 ілюстрацый на дзвюх старонках (афсет) . . . . . 208—209
Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР—3 ілюстрацыі (глыбокі друк) 224—225
Дзяржаўны народны аркестр БССР — 3 ілюстрацыі (глыбокі друк) . . . . . 224—225
Дзяржаўны народны хор БССР — 7 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 224—225
Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР імя М. Горкага — 7 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 224—225
Дзяржаўны сімфанічны аркестр БССР — 1 ілюстрацыя (глыбокі друк) . . . . 224—225
Дзяржаўны ансамбль танца БССР — 4 ілюстрацыі (глыбокі друк) . . . . . 224—225
Дзяржынскі Ф. Э.— 6 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 236—237
Дом-музей I з'езду РСДРП — 5 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 236—237
Драпежныя звяры — 13 ілюстрацый (афсет) . . . . . 272—273
Драпежныя птушкі — 11 ілюстрацый (афсет) . . . . . 272—273
Драўлянае дойлідства — 7 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 144—145
Другая сусветная вайна — 14 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . 280—281
Дываны — 3 ілюстрацыі (афсет) . . . . 46—47
Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва — 13 ілюстрацый на чатырох старонках (афсет) . . . . . 352—353
Дэкаратыўныя расліны — 16 ілюстрацый на дзвюх старонках (афсет) . . . . 360—361
Егіпет — 15 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 376—377
Жалезабетонныя канструкцыі — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 400—401
Жалезны век — 25 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 400—401
Жукі — 50 ілюстрацый на дзвюх старонках (афсет) . . . . . 424—425
Жывапіс — 11 ілюстрацый на пяці старонках (чатырохколерная аўтатыпія) 428—429
Жывёлагадоўля — 6 ілюстрацый (глыбокі друк) . . . . . 400—401
Жыллё — 14 ілюстрацый на дзвюх старонках (глыбокі друк) . . . . . 440—441
Зайцаў Я. А.— 1 ілюстрацыя (чатырохколерная аўтатыпія) . . . . . 432—433
Земнаводныя — 14 ілюстрацый (афсет) 560—561
Злучаныя Штаты Амерыкі — 25 ілюстрацый на чатырох старонках (глыбокі друк) . . . . . 576—577
Змеі — 11 ілюстрацый (афсет) . . . . . 560—561
Знакі дарожныя — 83 ілюстрацыі на дзвюх старонках (афсет) . . . . . 586—587

СПІС КАРТАЎ

Гродзенская вобласць (каляровая) . . . 12—13
Гродзенская вобласць, эканамічная карта (каляровая) . . . . . 12—13
Гродзенскі раён 22
Грузінская ССР (каляровая) . . . . . 34—35
Грузінская ССР, эканамічная карта . . 34—35
Грунвальдская бітва 15.VII.1410 г. . . . 44
Грэнландыя 63
Грэцыя (каляровая) . . . . . 72—73
Грэцыя Старажытная ў V—IV ст. да н. э. (каляровая) . . . . . 72—73
Грэцыя, эканамічная карта 68
Гур'еўская вобласць 88
Дагамея 113
Дагестанская АССР 114
Дамініканская Рэспубліка 132
Данецкая вобласць 136
Данія 140
Данія, эканамічная карта 141
Джамбульская вобласць 181
Дзяржынскі раён 239
Дзятлаўскі раён 242
Дняпрапятроўская вобласць 245
Добрушскі раён 251
Докшыцкі раён 255
Доўбар-Мусніцкага мяцеж 261

Драгічынскі раён 266
Другая сусветная вайна. Еўрапейскі тэатр ваенных дзеянняў (каляровая) . 278—279
Другая сусветная вайна. Ціхаакіянскі тэатр ваенных дзеянняў (каляровая) . 278—279
Дрыгавічы 292
Дубровенскі раён 305
Дыялект. Групоўкі гаворак на тэрыторыі Беларусі (каляровая) . . . . . 344—345
Егіпет Старажытны 375
Ельскі раён 381
Еўропа, геалагічная карта (каляровая) 392—393
Еўропа, палітычная карта (каляровая) 392—393
Еўропа, фізічная карта (каляровая) . 392—393
Еўропа, этнаграфічная карта (каляровая) . . . . . 392—393
Жабінкаўскі раён 398
Жалезны век на тэрыторыі Беларусі (каляровая) . . . . . 344—345
Жлобінскі раён 416
Жыткавіцкі раён 449
Жытомірская вобласць 450
Заказнікі. Схема размяшчэння запаведнікаў і заказнікаў на тэрыторыі Беларусі 474
Закарпацкая вобласць 475
Залатая Арда ў XIII ст. 479
Замбія 488
Запарожская вобласць 495
Землетрасенні і вулканы свету (каляровая) . . . . . 556—557
Злучаныя Штаты Амерыкі, палітыка-адміністрацыйная карта (каляровая) . 568—569
Злучаныя Штаты Амерыкі, фізічная карта (каляровая) . . . . . 568—569
Злучаныя Штаты Амерыкі, эканамічная карта (каляровая) . . . . . 568—569
Зоагеаграфічныя вобласці сушы (каляровая) . . . . . 556—557
Зорнае неба (каляровая) . . . . . 556—557

СУПРАЦОЎНІКІ ГАЛОЎНАЙ РЭДАКЦЫІ БелСЭ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ І ВЫДАННІ 4 ТОМА

КІРАЎНІЦТВА ГАЛОЎНАЙ РЭДАКЦЫІ

Галоўны рэдактар — акад. АН БССР П. У. Броўка. Намеснік галоўнага рэдактара — д-р філас. навук праф. П. Дз. Пузікаў. Намеснік галоўнага рэдактара — І. Д. Казека. Адказны сакратар рэдакцыйнай калегіі — канд. гістар. навук А. Л. Петрашкевіч. Намеснік галоўнага рэдактара па вытворчасці — П. П. Журкевіч.

НАВУКОВА-ГАЛІНОВЫЯ І КАНТРОЛЬНЫЯ РЭДАКЦЫІ

Біялогія, медыцына і сельская гаспадарка

Заг. рэд.— канд. біял. навук Р. К. Кажэўнікава; ст. навук. рэдактары: Л. М. Гаршанава, М. А. Кулікава; навук. рэдактары Б. М. Прусакова, А. У. Усцінава; мал. рэдактар М. В. Стральчэня.

Геаграфія і геалогія

Заг. рэд.— Я. А. Якубоўскі; ст. навук. рэдактар І. Д. Несцяровіч; навук. рэдактары: В. П. Варанцова, В. М. Вераценнікава, Т. І. Гузава, С. В. Курач, А. А. Шэўрова; рэдактар В. С. Вайткевіч; мал. рэдактар Н. Я. Ніканюк.

Гісторыя БССР і археалогія

Заг. рэд.— канд. гістар. навук Э. М. Савіцкі; ст. навук. рэдактар М. І. Камінскі; навук. рэдактар В. В. Гетаў; рэдактар Н. В. Паўлоўская; мал. рэдактар А. І. Валаховіч.

Гісторыя СССР, КПСС і КПБ

Заг. рэд.— канд. гістар. навук І. П. Хаўратовіч; ст. навук. рэдактары: А. І. Марозава, Н. А. Русак, В. С. Семенякоў; навук. рэдактары: В. М. Барадуліна, Н. У. Капранава, Ф. Я. Кляцкоў, В. С. Павалініна; мал. рэдактары: А. С. Жмуроўскі, В. В. Казлова.

Літаратура, мова, фальклор і этнаграфія

Заг. рэд.— В. І. Рабкевіч; ст. навук. рэдактары: В. К. Небышынец, І. У. Саламевіч; навук. рэдактар Дз. Д. Супрун, мал. рэдактар Р. А. Ларчанка.

Мастацтва і архітэктура

Заг. рэд.— канд. мастацтвазнаўства дацэнт Г. І. Барышаў; ст. навук. рэдактар А. А. Саламаха; навук. рэдактары: М. М. Клімковіч, Дз. У. Стэльмах; рэдактар Г. П. Прахарэнка; мал. рэдактар Л. С. Іванова.

Народная асвета і друк

Заг. рэд.— канд. філас. навук Дз. П. Радзюк; ст. навук. рэдактар І. І. Смірнова; навук. рэдактар А. С. Ткачова; рэдактар Н. І. Стаховіч.

Тэхніка

Заг. рэд.— Л. С. Караічаў; ст. навук. рэдактар — канд. тэхн. навук Я. Г. Бандарэнка; навук. рэдактары: І. У. Косціна, Б. С. Мельнікаў.

Усеагульная гісторыя

Заг. рэд.— канд. філас. навук Дз. М. Мацлс; ст. навук. рэдактар А. Дз. Зубар; навук. рэдактар Н. І. Кліменка; мал. рэдактар Г. М. Булат.

Фізіка, матэматыка, хімія і астраномія

Заг. рэд.— канд. фіз.-матэм. навук У. М. Трацякоў; ст. навук. рэдактар В. В. Хадыка; навук. рэдактар Г. І. Раманава; мал. рэдактар З. І. Іўчанка.

Філасофія і права

Заг. рэд.— А. П. Ратайка; ст. навук. рэдактар З. П. Кузьмічэнка; навук. рэдактар А. І. Казачок; рэдактар М. А. Іванові̆ч.

Эканоміка

Заг. рэд.— У. А. Салановіч; ст. навук. рэдактар І. Ц. Рудаман; навук. рэдактар Н. П. Саламевіч; мал. рэдактар Н. К. Матвеенцава.

Навукова-кантрольная рэдакцыя

Заг. рэд.— канд. эканам. навук Э. А. Юшкевіч; ст. навук. рэдактары: канд. мастацтвазнаўства Т. Дз. Арлова, канд. біял. навук Л. П. Міцько; І. Я. Афнагель, У. М. Сацута; навук. рэдактары: С. П. Самуэль, Т. У. Тамільчык; мал. рэдактары: Л. П. Маліконак, К. П. Мацлс.

Група бібліяграфіі. Навук. рэдактары: Т. Р. Сабаленка, А. А. Тарасава; рэдактар Л. І. Рагаўцова.

Літаратурна-кантрольная рэдакцыя

Заг. рэд.— І. А. Скрыган; ст. навук. рэдактары: М. К. Клышка, Н. М. Сямашка; навук. рэдактары: М. Р. Каваленка, Е. П. Фешчанка; рэдактар М. Э. Самуйлёнак.

Група транскрыпцыі. Навук. рэдактары: І. П. Крэнь, Н. А. Ясінская; мал. рэдактар Г. А. Фатыхава.

Рэдакцыя слоўніка

Заг. рэд.— Н. П. Колас; рэдактар В. А. Міхайлоўская; мал. рэдактары: М. І. Бязладнава, М. А. Федасеенка.

Рэдакцыя ілюстрацыі і картаграфіі

Заг. рэд.— С. П. Русак; навук. рэдактар В. А. Ярмоленка; мал. рэд. Н. І. Кукіна.

Група картаграфіі. Ст. навук. рэдактар-картограф Н. М. Махавікова; навук. рэдактар-картограф Г. Р. Шыкунова; рэдактар-картограф Я. П. Цупа; чарцёжніца-афарміцель Л. А. Панцялеева.

Група падрыхтоўкі фотаілюстрацый. Р. Ф. Валадзько, П. М. Захарэнка.

АДДЗЕЛЫ І ГРУПЫ

Вытворчы аддзел

Заг. аддзела — У. М. Вержбаловіч; ст. рэдактар Н. П. Сцяпанава; ст. тэхн. рэдактар Г. І. Емец; выпускаючы З. М. Белавус.

Лабараторыя фотакапіравальных размнажальных апаратаў. Загадчык В. А. Трубчак; лабарант М. П. Бажэнаў; пераплётчыцы: Ю. І. Кароль, Я. М. Кузьміна; друкар М. Р. Данілік.

Карэктарскі аддзел

Заг. аддзела — Г. І. Ткачова; ст. карэктары: Н. Ф. Багдановіч, Л. Дз. Лебедзева, В. І. Плашчынская, Л. І. Саўчанка, Л. А. Сівалобчык; карэктар Л. І. Дорская.

Група камплектавання

Рэдактар М. І. Макаранка; мал. рэдактар Л. В. Календа.

Машынапіснае бюро

Заг. бюро — Л. Л. Ляшчынская; машыністкі-перакладчыцы: Г. А. Анісімава, Н. П. Ракіцкая.

Службовы персанал

Гал. бухгалтар А. Ц. Крыўчык; бухгалтар-касір Т. В. Каласоўская; ст. інспектар Л. А. Антаневіч, ст. інспектар па кадрах А. П. Калеснікаў; ст. планавік-эканаміст Т. І. Лук'янава; заг. навук. архіва К. І. Броннікава, ст. бібліятэкар Г. Я. Няхайчык; бібліятэкар-бібліёграф Т. А. Навіцкая; сакратар-машыністка Л. В. Парнякова; заг. матэрыяльнага склада А. К. Пацехіна; ст. эканаміст па забеспячэнні Я. Р. Кляцко.

ВЫТВОРЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ ЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў ВЫДАННІ 4 ТОМА БелСЭ

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа

Дырэктар Р. А. Шаўчэнка; галоўны інжынер С. Ц. Сізаненка; галоўны тэхнолаг Р. І. Шапавалава; начальнік вытворчага аддзела К. С. Каламейцава; начальнік наборнага цэха К. П. Федарук; ст. майстар цэха П. А. Сержан; тэхнолаг цэха Л. В. Абраменка; майстры лінатыпнага аддзялення: В. А. Салдаценка, Г. У. Крыштаповіч; лінатыпісткі: Г. І. Мініч, Н. Ф. Церахава, Г. Я. Жардзецкая; праўшчыца М. І. Ясюкевіч; майстар вярстальнага аддзялення В. Л. Дзергілёва; вярстальшчык І. П. Казлоўскі; майстар абкладачнага аддзялення Ф. І. Жукоўскі; майстар цынкаграфіі М. А. Гарбачоў; аператар вырыклішографа У. П. Стукач; травільшчыкі: Б. І. Акола, В. П. Апарын; заг. карэктарскай Л. І. Ліхтаровіч; карэктары: Л. В. Апаровіч, Э. Я. Зялеўская; начальнік друкарскага цэха А. М. Капусцін; ст. майстар цэха М. У. Яскевіч; тэхнолаг цэха Г. Л. Валчок; майстры цэха: А. І. Гладун, Я. Дз. Жукоўская, Л. Я. Рашэтнікава; брыгада друкароў: А. П. Абмётка, Р. М. Бандарэнка, М. М. Левін, І. М. Мілеўскі, Ф. В. Навахрост, Б. А. Чарняўскі; начальнік афсетнага цэха Г. Г. Каралёва; тэхнолаг цэха Я. А. Куляшова; майстар рэтушорнага аддзялення В. П. Міхальчын; рэтушор У. В. Міньков; майстар друкарскага аддзялення А. Дз. Таэіева; брыгада друкароў: А. А. Бандарэнка, П. М. Парфенчык; начальнік пачнага цэха Т. В. Мельнік; тэхнолаг цэха Н. Д. Асадоўская; майстар Н. М. Дражына; пасалотчыцы: В. В. Баравік, М. П. Варанкова, Л. А. Кіневіч, Н. П. Шарапава; начальнік пераплётна-брашуровачнага цэха Б. І. Штульман; ст. майстар цэха З. А. Худава; тэхнолаг цэха В. М. Савіцкая, майстры цэха: З. І. Вішнеўская, Н. В. Крылова, С. С. Крэза, В. У. Савіцкая, І. А. Сінкевіч, З. С. Ячнік; машыніст БТГ Л. В. Квяткоўскі, машыністы В-2 Г. М. Касцевіч, З. І. Рак; швачкі: М. М. Канаш, К. С. Левандоўская, Я. З. Няхайчык, К. М. Памаданава, Г. К. Пятроўская; машыніст БПА Т. Ф. Іванові̆ч; прыклейшчыцы: І. Ю. Гладкая, Р. А. Жаўнова, І. Я. Паставойценка, С. С. Раманчык; рэзчыкі: Т. М. Сідарэнка, Н. Я. Шкода.

Друкарня Выдавецтва ЦК КПБ

Дырэктар П. А. Царoў; галоўны інжынер П. В. Карпаў; намеснік дырэктара па вытворчасці С. Г. Сцяпанаў; галоўны тэхнолаг Р. І. Жытомірскі; начальнік цэха глыбокага друку С. М. Пасмяцюха; фатограф М. А. Роганаў; рэтушоры: У. Д. Бурак, Л. А. Навікоўскі; травільшчыкі: Я. В. Гаўрылаў, Г. А. Ленскі; друкары: П. А. Каспяровіч, В. К. Клачко.

Фабрыка № 2 ГУГК пры Савеце Міністраў СССР

Дырэктар В. В. Урусаў; галоўны інжынер А. А. Ляўшнаў; начальнік цэха № 1 М. С. Рутковская; ст. рэдактар Г. І. Гулюк; рэдактары: С. М. Герасімава, В. С. Собалева; інжынеры-картографы: Л. Ф. Жмака, Л. М. Фамічова; тэхнікі-картографы: І. В. Арцюх, А. К. Мілюткіна; тэхнічны рэдактар К. Я. Ярашэвіч; начальнік цэха № 2 А. І. Бабуркін; ст. майстар А. В. Свірына; прабіст А. М. Багдановіч; гравёр З. А. Баранчык; капіроўшчык М. М. Васілеўскі; начальнік цэха № 3 Я. І. Негнівіцкі; ст. майстар М. Н. Панцялееў; майстар К. С. Грыневіч; друкары: В. А. Грудзінка, Н. А. Прачкоўская.

Ілюстрацыі на ўклейках і ў тэксце выкананы мастакі: Ю. С. Архіпаў, П. Ф. Бараздыка, І. Д. Кока, П. П. Лысенка, П. Н. Мартынчык, М. М. Свілгін, Л. І. Усачоў, А. Р. Федзін, Г. К. Шэлег.

У томе змешчаны фотаздымкі У. У. Адарыча, М. П. Ананьіна, П. Я. Белавус, П. М. Захарэнкі, У. А. Крука, Дз. Б. Новікава, а таксама фотаздымкі ТАСС, АДН, БелТА, фондаў Беларускага тэатральнага таварыства, Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кіна-, фота-, фонадакументаў БССР.

03
Б43

Беларуская Савецкая Энцыклапедыя

Гал. рэд.— П. У. Броўка.
Т. 4 — Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, Мн., 1971.
Т. 4. Графік — Зуйка. 608 стар. з іл. і картамі.

Белорусская Советская Энциклопедия, т. 4
(на белорусском языке).
Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Мінск, Акадэмічная, 15-а.

У томе змешчана: 17 уклеек глыбокага друку (234 ілюстрацыі), 11 уклеек афсетнага друку (278 ілюстрацый), 11 уклеек каляровых картаў, 3 уклейкі каляровага высокага друку (12 ілюстрацый), у тэксце 619 ілюстрацый і 32 карты. Папера для тэксту выраблена на фабрыцы імя Ю. Яноніса. Каляровыя карты надрукаваны на фабрыцы № 2 ГУТК. Уклейкі глыбокага друку надрукаваны ў друкарні Выдавецтва ЦК КПБ.

Здадзена ў набор 17.2.1971 г., падпісана да друку 13.8.1971 г. АТ 03419. Тыраж 25 000 экз. Фармат 70×100¹/₁₆. Фіз. друк. арк. 38+4,875 арк. ўклеек. Ум. друк. арк. 49,02+6,28 арк. ўклеек. Усяго ўлікова-выдавецкіх арк. 101,76. Цана 2 р. 50 к. Зак. 629.

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа, Мінск, Красная, 23.